БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ў 18 ТАМАХ

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ТОМ 17

ХВІНЯВІЧЫ
ШЧЫТНІ

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

Г.П.ПАШКОЎ (галоўны рэдактар), **В.С.АНОШКА, Я.М.БАБОСАЎ, В.К.БАНДАРЧЫК, М.А.БАРЫСЕВІЧ, В.І.БОЎШ, Т.Я.БУРАКОВА** (намеснік галоўнага рэдактара), **А.П.ВАЙТОВІЧ, І.Дз.ВАЛАТОЎСКІ, М.С.ВЫСОЦКІ, І.В.ГАЙШУН, А.М.ГАНЧАРЭНКА, Р.Г.ГАРЭЦКІ, В.М.ГУРЫН, А.М.ДАНІЛАЎ, В.В.ЗУЁНАК, М.П.КАСЦЮК, І.В.КАТЛЯРОЎ, С.Н.КНЯЗЕЎ, П.Д.КУХАРЧЫК, У.Р.ЛАТЫПАЎ, С.С.ЛАЎШУК, І.М.ЛУЧАНОК, Г.М.ЛЫЧ, Л.С.МАЛЬЦАЎ, А.В.МАЦВЕЕЎ, І.Я.НАВУМЕНКА, А.І.ПАДЛУЖНЫ, П.Ц.ПЕТРЫКАЎ, М.Ф.ПІЛІПЕНКА, У.В.РУСАКЕВІЧ, А.В.САБАЛЕЎСКІ, М.А.САВІЦКІ, А.Г.СЛУКА, М.С.СТАШКЕВІЧ, М.В.СТОРАЖАЎ, Л.М.СУШЧЭНЯ, А.К.ФЯДОСАЎ** (намеснік галоўнага рэдактара — адказны сакратар), **І.П.ХАЎРАТОВІЧ, І.П.ШАМЯКІН, В.П.ШАРАНГОВІЧ.**

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
2003

УДК 03(476)
ББК 92(4Беи)
Б 43

НАВУКОВА-РЭДАКЦЫЙНЫ САВЕТ:

А.М.АБРАМОВІЧ, У.І.АДАМУШКА, А.І.АКСЁНЕНКА, Я.Я.АЛЯКСЕЙЧЫК, М.М.АЛЯХНОВІЧ, І.П.АНТОНАЎ, П.А.АПАНАСЕВІЧ, Ю.В.БАЖЭНАЎ, М.Р.БАРАЗНА, У.С.БАСАЛЫГА, В.І.БЕРНІК, А.А.БОГУШ, А.І.БОЛСУН, Ю.П.БРОЎКА, П.І.БРЫГАДЗІН, В.С.БУРАКОЎ, З.А.ВАЛЕВАЧ, У.К.ВАРАБ'ЁЎ, У.П.ВЯЛІЧКА, У.С.ГЛУШАКОЎ, А.П.ГРЫЦКЕВІЧ, А.П.ДАСТАНКА, М.І.ДЗЯМЧУК, С.Ф.ДУБЯНЕЦКІ, Р.А.ЖМОЙДЗЯК, В.П.ЖУРАЎЛЁЎ, Э.М.ЗАГАРУЛЬСКІ, М.Е.ЗАЯЦ, М.А.ІЗОБАЎ, У.В.КАВАЛЁНАК, Л.В.КАЛЕНДА, Я.Ф.КАНАПЛЯ, Ф.М.КАПУЦКІ, Л.В.КІРЫЛЕНКА, В.П.КІСЕЛЬ, П.І.КЛІМУК, У.М.КОНАН, У.С.КОШАЛЕЎ, А.В.КРАСІНСКІ, Б.А.ЛАЗУКА, І.І.ЛЕАНОВІЧ, А.І.ЛЕСНІКОВІЧ, А.С.ЛІС, А.М.ЛІТВІН, І.І.ЛІШТВАН, У.Ф.ЛОГІНАЎ, З.Я.МАЖЭЙКА, А.С.МАЙХРОВІЧ, А.В.МАЛЬДЗІС, А.Я.МІХНЕВІЧ, У.М.МІХНЮК, Дз.І.МЯЦЕЛІЦА, М.В.НІКАЛАЕЎ, П.Г.НІКІЦЕНКА, В.І.ПАРФЁНАЎ, У.А.ПІЛІПОВІЧ, Л.Д.ПОБАЛЬ, І.М.ПТАШНІКАЎ, П.І.РОГАЧ, А.У.РУСЕЦКІ, А.І.РУЦКІ, С.А.СЕРГАЧОЎ, І.Д.СІПАКОЎ, Э.М.СКОБЕЛЕЎ, Р.Б.СМОЛЬСКІ, А.А.ТОЗІК, А.А.ФІЛІМОНАЎ, В.А.ФЯДОСІК, Л.У.ХАТЫЛЁВА, В.С.ЦІТОЎ, Ю.М.ЧУРКО, В.У.ЧЭЧАТ, В.Ф.ШМАТАЎ, Г.В.ШТЫХАЎ, Дз.І.ШЫРАКАНАЎ, Г.М.ШЭЙКІН, Л.У.ЯЗЫКОВІЧ.

НАВУКОВЫЯ КАНСУЛЬТАНТЫ:

М.Э.АБАЛА (Латвія), **А.А.АБРАМЧУК, Т.І.АДУЛА, Р.М.АЛАДАВА, А.Ц.БАЖКО, Я.І.БАРАНОЎСКІ, А.А.БАРШЧЭЎСКІ** (Польшча), **Л.П.БАРШЧЭЎСКІ, С.І.БЕЛЬСКАЯ, М.С.ВАЙТОВІЧ, Г.В.ВАЛАБУЕВА, А.І.ВАЛОЖЫН, Э.А.ВАЛЬЧУК, І.В.ВЕЛЬДЖАНАЎ** (Туркменістан), **А.А.ГАЛАЎКО, А.І.ГАЛАЎНЁЎ, С.В.ГОВІН, Л.І.ГУРСКІ, А.А.ГУСАК, Б.Дз.ДАЛГАТОВІЧ, І.У.ДУДА, А.М.ЕЛСУКОЎ, А.І.ЕРАШОЎ, А.І.ЖУРАЎСКІ, У.Р.ЗАЛАТАГОРАЎ, Р.Г.ЗАЯЦ, Э.Р.ІОФЕ, У.Ф.ІСАЕНКА, Л.Р.КАЗЛОЎ, Л.В.КАЗЛОЎСКАЯ, В.М.КАНДРАЦЬЕЎ, Р.КАРЭЦКАС** (Літва), **М.М.КАСЦЮКОВІЧ, У.У.КОЖУХ, У.К.КОРШУК, Г.Р.КУЛЯШОВА, У.Ф.ЛАДЫСЕЎ, А.А.ЛАЗАРЭВІЧ, І.Л.ЛАПІН, А.П.ЛАПІНСКЕНЕ** (Літва), **У.С.ЛАРЫЁНАЎ, А.П.ЛАСКАЎНЁЎ, М.В.ЛАЎРЫНОВІЧ, А.С.ЛЕАНЦЮК, У.І.ЛЕМЯШОНАК, Э.А.ЛІПЕЦКІ, Е.А.ЛЯВОНАВА, Р.Ч.ЛЯНЬКЕВІЧ, К.Л.МАЙСЯЙЧУК, С.Дз.МАЛЮКОВІЧ, В.Дз.МАРОЗАЎ, Я.Г.МІЛЯШКЕВІЧ, Л.І.НАВУМЕНКА, В.М.НАВУМЧЫК, В.Л.НАСЕВІЧ, М.А.ПАКЛОНСКІ, М.Р.ПРАКАПЧУК, В.М.ПРОХАРАЎ, П.А.ПУПКЕВІЧ, В.П.РАГОЙША, Л.М.РАЖАНАВА, А.РАЧЫС** (Літва), **М.П.САВІК, У.Л.САКАЛОЎСКІ, Л.Ф.САЛАВЕЙ, Э.Р.САМУСЕНКА, С.Н.САРЫНЯН** (Арменія), **Я.М.САХУТА, І.С.САЦУНКЕВІЧ, В.Дз.СЕЛЯМЕНЕЎ, І.М.СЕМЯНЕНЯ, У.М.СЕЎРУК, І.І.СІНЧУК, В.П.СЛАВУК, У.Е.СНАПКОЎСКІ, М.Ф.СПІРЫДОНАЎ, Г.Г.СЯРГЕЕВА, А.П.ТКАЧЭНКА, В.Ф.ЦАРОВА** (Латвія), **А.А.ЦІТАВЕЦ, Г.А.ЦЫХУН, В.А.ЧАБАНЕНКА** (Украіна), **А.А.ЧАЛЯДЗІНСКІ, В.М.ЧАРНАТАЎ, І.А.ЧАРОТА, Г.Г.ШАНЬКО, А.В.ШАРАПА, Л.П.ШАХОЦЬКА, Я.Ф.ШУНЕЙКА, А.П.ШЧУРАЎ, А.А.ШЫМБАЛЁЎ, М.Р.ЮРКЕВІЧ, М.З.ЯГОЎДЗІК, В.І.ЯКАЎЧУК, А.А.ЯРАШЭВІЧ.**

Мастацкае афармленне **Э.Э.ЖАКЕВІЧА, А.М.ХІЛЬКЕВІЧА**

ISBN 985-11-0279-2 (т. 17)
ISBN 985-11-0035-8

© Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі, 2003

Х

ХВІНЯВІ́ЧЫ, вёска ў Дзятлаўскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр Парэцкага с/с і калгаса. За 15 км на З ад г. Дзятлава, 150 км ад Гродна, 28 км ад чыг. ст. Наваельня. 469 ж., 189 двароў (2002). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аптэка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ХВО́ЙНІК, 1) род кветкавых раслін, тое, што *эфедра*. 2) Гл. *Хваёвыя лясы*.

ХВО́ЙНЫЯ ЛЯСЫ́, лясы з перавагай дрэў з лісцем ігольчастай або лускападобнай формы (хвояй). Характэрны для паўн. ч. ўмераных шырот Паўн. паўшар'я, у некат. раёнах субтропікаў і тропікаў. У Еўразіі ўтвараюць Еўразійскую таежную вобласць (гл. *Таежныя зоны, Тайга*).

Адрозніваюць Х.л. цемнахвойныя (яловыя, піхтавыя, кедравыя) і светлахвойныя (хваёвыя, лістоўнічныя); паводле геагр. месцазнаходжання і складу расліннасці — паўночна-, сярэдне- і паўднёватаежныя, падтаежныя, а таксама шыракаліста-хвойныя. Х.л. паўночна-таежнага тыпу зменьваюцца падтаежнымі і шыракаліста-хвойнымі з Пн на Пд. У іх на глебавым покрыве імхі, лішайнікі, хвашчы, папараці, дзярэзы, чарніцы, бруснічы і інш. Большасць Х.л. — карэнныя і ўмоўна-карэнныя, крыніца каштоўнай драўніны, маюць аэрааднаўленчае, кліматычнае, водарэгулявальнае і проціэразійнае значэнне.

На Беларусі Х.л. займаюць 67,2% плошчы пад лесам. Пераважаюць *хваёвыя лясы* і *яловыя лясы*.

ХВО́ЛЬСАН Арэст Данілавіч (4.12.1852, С.-Пецярбург — 11.5.1934), расійскі фізік і педагог, настаўнік некалькіх пакаленняў пецярбургскіх фізікаў. Ганаровы чл. АН СССР (1920). Герой Працы (1926). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1873), дзе працаваў з 1876 і адначасова ў інш. ВНУ. Навук. працы па электрычнасці, магнетызме, фотаметрыі і актынаметрыі. Прапанаваў канструкцыі актынометра і піргеліёметра, якія доўгі час выкарыстоўваліся на рас. метэастанцыях. Аўтар 5-томнага «Курса фізікі», які ў 1897—1926 неаднаразова перавыдаваўся.

Тв.: Физика наших дней. Л.; М., 1932.

Літ.: Баумгарт К.К. Выдающийся физик-профессор О.Д.Хвольсон // Электричество. 1953. № 1.

ХВО́РАСТ Іван Маркавіч (24.2.1902, в. Кацёлкі Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. — 1.7.1983), бел. танцоўшчык, балетмайстар, збіральнік бел. харэаграфічнага фальклору. Засл. работнік культ. Беларусі (1977). Скончыў Віленскі ун-т (1935), адначасова вучыўся ў прыватнай школе балетнага майстэрства. З 1928 саліст танц. групы хору Слав. песні Віленскай бел. гімназіі. У 1940—50 кіраўнік харэаграфічнай групы Бел. ансамбля песні і танца пад кіраўніцтвам Р.Шырмы. З 1953 саліст балета Бел. філармоніі, у 1960—78 кансультант Рэсп. Дома нар. творчасці. Зрабіў значны ўклад у развіццё бел. нар.-сцэн. танца. Стварыў сцэн. варыянты традыц. бел. танцаў («Таўкачыкі», «Мікіта», «Падушачка», «Козачка»), кадрыляў, карагодаў («Пойдзем, пойдзем лугам», «Дзявочы», «Лірычны»), харэаграфічных кампазіцый «Паланэз Агінскага», «Світанак над Свіцяззю». Аўтар зб-каў «Беларускія танцы» (1974, 1977). *В.М.Яшчанка.*

Хвоснік звычайны.

ХВО́СНІК, баляскі (Hippuris), род кветкавых раслін сям. хвоснікавых. 3 віды. Пашыраны ў Еўразіі, Паўн. Амерыцы і Аўстраліі. На Беларусі 1 від — Х. звычайны, або вадзяная сасонка (H. vulgaris). Трапляецца на багністых берагах рэк і азёр, вільготных лугах, нізінных балотах.

Шматгадовыя водныя травяністыя расліны з паўзучым карэнішчам. Сцёблы прамастойныя, членістыя, пустыя. Лісце суцэльнае, лінейнае, без прылісткаў, у кальчаках. Кветкі адзінкавыя, у пазухах лісця, дробныя, беспялёсткавыя, зеленаватыя. Плод — касцянка.

Дз.І.Траццякоў.

ХВОШЧ (Equisetum), род споравых раслін сям. хвашчовых. Каля 30 відаў. Пашыраны ўсюды, за выключэннем Аўстраліі і трапічнай Афрыкі. На Беларусі 8 відаў Х.: балотны (E. palustre), зімавальны (E. hyemale), лугавы (E. pratense), лясны (E. sylvaticum), палявы, або таўкачык (E. arvense), прырэчны (E. fluviatile). У Чырв. кнігу занесены Х. вялікі (E. telmateia) і стракаты (E. variegatum). Трапляюцца на балотах, лугах, у лясах і вадаёмах.

Шматгадовыя травы з цвёрдымі сцёбламі, насычанымі крэменязёмам, выш. да 1 м (у відаў, што палягаюць, даўж. да 9 м). Сцёблы членістыя, рабрыстыя, кальчаковыя, пустыя, мяккія (на зіму адмірaюць) або цвёрдыя (зімуюць); у некат. відаў зялёныя, на верхавінцы заканчваюцца стробілам, у інш. — вясной спараносныя, белаватыя ці бураватыя, летам вегетатыўныя, зялёныя. Лісце дробнае, лускападобнае, фотасінтэз адбываецца ў зялёных сцёблах і галінах. *Спарангіі* размешчаны на спарангіяфорах, сабраных у верхавінкавыя *стробілы*. Лек., харч., фарбавальныя расліны, некат. ядавітыя і пустазелле. *Дз.І.Траццякоў.*

ХВОШЧАПАДО́БНЫЯ, членістасцябловыя (Equisetophyta), аддзел вышэйшых споравых раслін. 3 кл.: хвашчовыя, кліналістыя, гіеніевыя. Паходзяць ад псілафітаў. Вядомы з верхняга дэвону, найб. пашырыліся ў карбоне, вымерлі ў пач. мезазою. Прадстаўнікі ўсіх класаў існуюць у выкапнёвым стане, акрамя роду *хвошч*.

Сучасныя Х. — шматгадовыя карэнішчавыя травы. Сцёблы ад некалькіх сантыметраў да некалькіх метраў, зялёныя (фотасінтэзуючыя) або 2 тыпаў: бесхларафільныя (спара-

носныя, хутка адмірающь) і зялёныя (вегетатыўныя). Усе віды сцёблаў баразнаватыя, расчлянёныя, як і карэнішчы, на вузлы і полыя міжвузеллі (адсюль другая назва). У вузлах кальчакі галін і дробнага, часта лускападобнага і бесхларафільнага лісця, якое зрастаецца похвамі ў трубку. *Спарангіі* ў верхавінкасенне паядаюць птушкі і белкі. Арэхаплодныя, тэхн., дэкар. расліны, выкарыстоўваюцца для замацавання пяскоў. *І.М.Гарановіч.*

Хвошч: 1 — палявы; 2 — лугавы; 3 — зімавальны; 4 — прырэчны; 5 — лясны.

вых *стробілах*. Расліны раўнаспоравыя. *Гаметафіт* (зарастак) адна- ці двухполы, зялёны, маленькі (некалькі міліметраў). Апладненне адбываецца толькі пры наяўнасці вады на паверхні гаметафіту. *Дз.І.Трацякоў.*

ХВО́Я, с а с н а (Pinus), род голанасенных раслін сям. хваёвых. Каля 100 відаў. Пашыраны ва ўмераным і субтрапічным паясах Паўн. паўшар'я і ў гарах. На Беларусі 1 від — Х. звычайная (P. sylvestris) — адна з гал. лесаўтваральных парод. Інтрадукавана каля 20 відаў Х.: веймутава (P. strobus), кедравая еўрапейская (P. cembra), кедравая сібірская (P. sibirica), кедравы сланік (P. pumila), румелійская (P. peucea) і інш.

Вечназялёныя аднадомныя дрэвы выш. 50—75 м, радзей кусты. Жывуць 300—500 гадоў. Каранёвая сістэма моцна развітая, стрыжнёвая. Крона маладых дрэў паўшарападобная, потым парасонападобная да плоскай. Ствол прамы, гладкі, кара лушчыцца. Ігліца доўгая і вузкая, у пучках па 2, 3 або 5, захоўваецца 3—6 гадоў. Шышкі разнастайнай формы і памераў. Насенне арэшкападобнае, звычайна з крыльцам. Група відаў Х. дае ядомае, часцей бяскрылае насенне, т.зв. кедравыя арэхі. Драўніна выкарыстоўваецца ў буд-ве, як паліва, ідзе на вырабы. З яе атрымліваюць шкіпінар, каніфоль, тэрпенцінавы алей, смалу, вар, дзёгаць; з ігліцы — вітамін С, эфірны алей; з насення — кедравы алей. Парасткі і кара — зімовы корм для ласёў, на-

Хвоя: 1 — агульны выгляд. Парасткі, шышкі і насенне хвоі: 2 — звычайнай; 3 — кедравай еўрапейскай; 4 — горнай; 5 — веймутавай; 6 — Банкса.

ХЕ́ВЕШЫ (Hevesy) Дзьёрдзь (Георг; 1.8.1885, Будапешт — 5.7.1966), венгерскі радыяхімік. Ганаровы чл. Венг. АН (1945). Замежны чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1939). Скончыў Будапешцкі ун-т (1908). Праф. ун-таў у Будапешце (1918), Капенгагене (1920—26, 1934—43), Фрайбургу (1926—34), Стакгольме (з 1943). Навук. працы ў галіне радыяхіміі. Прапанаваў метад ізатопных індыкатараў (мечаных атамаў) і выкарыстаў яго для біял. даследаванняў (1913). Адкрыў хім. элемент *гафній* (з нідэрл. фізікам Дз.Костэрам), магчымасць выкарыстання цяжкай вады для вызначэння воднага балансу ў жывых арганізмах (1941). Нобелеўская прэмія 1943. Міжнар. прэмія «Атам для міру» (1959).

ХЕ́ВІСАЙД (Heaviside) Олівер (18.5.1850, Лондан — 3.2.1925), англійскі фізік, адзін са стваральнікаў аперацыйнага злічэння. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1891). З 1866 у тэлегр. кампаніі ў г. Ньюкасл, з 1874 ва ўласнай лабараторыі. Навук. працы па электрамагнетызме і матэм. фізіцы. Даследаваў распаўсюджванне эл.-магн. ваганняў па адна- і двухправодных лініях, увёў (незалежна ад Дж.Г.*Пойнтынга* і М.А.*Умава*) вектар шчыльнасці патоку эл.-магн. энергіі, стварыў тэорыю перадачы сігналаў на далёкія адлегласці. Незалежна ад Дж.У.*Рэлея* пабудаваў тэорыю скін-эфекту (1886). Паказаў, што маса зараджанай часціцы мяняецца ў залежнасці ад скорасці (1892). Пастуліраваў існаванне іанізава-

нага слоя атмасферы, што адбівае эл.-магн. хвалі (1902).

ХЕ́ДА, Г е д а (Heda) Вілем Клас (каля 1594, г. Харлем, Нідэрланды — каля 1680), галандскі жывапісец. Працаваў у Харлеме. Зазнаў уплыў П.*Класа*. Яго сціплым нацюрмортам, т.зв. сняданкам, у якіх, як правіла, перададзены невял. набор прадметаў хатняга начыння і трапезы, уласцівы тонкае майстэрства ў перадачы фактуры рэчаў, стрыманы серабрыста-карычневы каларыт: «Сняданак з ажынавым пірагом» (1631), «Сняданак з крабам» (1648), «Вяндліна і сярэбраны посуд» (1649).

Дз.**Хевешы**.

Т.**Хеердал**.

К.Г.В. фон **Хейдэнстам**.

ХЕ́ДЭБЮ, Х а й т х а б у (Hedeby, Haithabu, літаральна — горад язычнікаў), паселішча ў Даніі (на ПдУ п-ва Ютландыя, на Пд ад г. Шлезвіг, цяпер у ФРГ), якое існавала ў 9 — сярэдзіне 11 ст. У час экспансіі *вікінгаў* Х. быў адным з важнейшых гандл. пунктаў Паўн. Еўропы, які звязваў краіны Балтыкі і Усходу з Зах. Еўропай. За валоданне Х. вялася барацьба паміж датчанамі, немцамі, шведамі, славянамі, нарвежцамі, што скончылася яго разбурэннем. Археал. даследаваннямі ў 1930-я г. выяўлены рэшткі ваен. і гандл.-рамеснага паселішча, гавані і ўмацаванняў вакол Х.

ХЕ́ЕРДАЛ (Heyerdahl) Тур (6.10.1914, г. Ларвік, Нарвегія — 18.4.2002), нарвежскі вучоны, падарожнік, пісьменнік. Чл. Нарв. АН (з 1958). Ганаровы д-р ун-та Осла (1961). Вучыўся ва ун-це Осла (1933—38). Вывучаў пераемнасць культуры і магчымасць трансакіянскіх міграцый народаў паміж Старым і Новым Светам. Каб пацвердзіць сваю тэорыю пра засяленне а-воў Палінезіі з Амерыкі, у 1947 праплыў з экіпажам на плыце *«Кон-Цікі»* ад Перу да архіпелага Туамоту, у 1969 і 1970 — на папірусных лодках *«Ра»* і «Ра-2» ад Афрыкі да а-воў Цэнтр. Амерыкі, у 1977—78 — на трысняговай лодцы «Тыгрыс» па маршруце Эль-Курна (Ірак) — вусце р. Інд—Джыбуці. Уражанні ад падарожжаў у кнігах «Падарожжа на «Кон-Цікі» (1949), «Аку-Аку» (1957), «Ра» (1970), «Фату-Хіва» (1975), «Тыгрыс» (1979) і інш. Займаўся археал. пошукамі ў Перу, Балівіі, Эквадоры, на Галапагоскіх а-вах і в-ве Рапануі (Вялікадня). Аўтар прац па антрапалогіі, стараж. гісторыі Акіяніі і Амерыкі. На бел. мову асобныя яго творы пераклаў С.Міхальчук.

Тв.: Бел. пер. — Падарожжа на «Кон-Цікі»; На плыце ад Перу да Палінезіі. Мн., 1958; Рус. пер. — Приключения одной теории. Л., 1969; В поисках рая; Аку-Аку. М., 1970; Экспедиция «Кон-Тики»; «Ра». М., 1972.

Літ.: Я к о б и А. Сеньор Кон-Тики: Пер. с норв. М., 1970.

ХЕЙДА́РАВА (П а ў л і к а в а) Людміла Фёдараўна (н. 11.2.1952, пас. Ялізава Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл.), бел. паэтэса. Скончыла БДУ (1974). З 1974 працавала ў НДІ электронна-вылічаль. машын, у Бел. н.-д. і праектна-тэхнал. ін-це арганізацыі і кіравання буд-вам пры Дзяржбудзе Беларусі, у Мінскім н.-д. праектным ін-це. У 1987—97 на Бел. тэлебачанні. Друкуецца з 1980. У вершах філас. роздум над праблемамі сучаснасці, гарадскія матывы (зб-кі «Адведзіны рамонкавай паляны», 1985; «Тваё святло», 1988; «Купанне ў росах», 1993). Аўтар паэмы «Нельга і Можна» (1988), апавяданняў. На бел. мову пераклала асобныя творы Г.Ахматавай, М.Валошына, М.Лермантава, Б.Пастарнака, М.Цвятаевай і інш.

Тв.: Дарт: Жыццёвыя гісторыі. Мн., 2002.

І.У.Саламевіч.

ХЕ́ЙДАРАЎ Васіль Пятровіч (н. 10.10.1935, в. Кішчыцы Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне фармацыі. Д-р фармацэўт. н. (1993), праф. (1995). Скончыў Днепрапятроўскі мед. ін-т (1963) і Маскоўскі пед. ін-т (1982). З 1963 у Віцебскім мед. ун-це (у 1973—2000 заг. кафедры). Навук. працы па фармацэўтычным аналізе лек. рэчываў, кінетыцы, тэрмадынаміцы і механізме хім. рэакцый.

Тв.: Кинетика и механизм реакции в системе теофиллин—хлорамин—тимол (разам з Ю.А.Яршовым, У.А.Паленавым) // Кинетика и катализ. 1991. Т. 32, вып. 5; Кинетика термического разложения гипохлорита натрия в водных растворах при различной кислотности среды (у сааўт.) // Журнал физ. химии. 2002. Т. 76, № 5.

ХЕ́ЙДЭНСТАМ (Heidenstam) Карл Густаў Вернер фон (6.7.1859, Ольсхамар, Швецыя — 20.5.1940), шведскі пісьменнік. Чл. Швед. акадэміі (з 1912). Дэбютаваў неарамант. зб. паэзіі «Паломніцтва і гады вандровак» (1888). У эсэ «Рэнесанс» (1889) выступіў супраць натуралізму. Спалучэнне аўтабіягр. рыс з фантаст. элементамі ў рамане ў прозе і вершах «Ханс Аліенус» (1892), напісаным пад уплывам ідэй Ф.В.*Ніцшэ*. Патрыят. паэзія ў неарамант. духу ў зб-ках «Вершы» (1895), «Народ» (1899). У зб-ках «Новыя вершы» (1915) і «Апошнія вершы» (апубл. 1942) зварот да класіцыстычнага метаду. У зб-ках навел «Каралінцы» (т. 1—2, 1897—98), «Святы Георгій і дракон» (1900), раманах «Паломніцтва святой Біргіты» (1901), «Род Фолькунгаў» (т. 1—2, 1905—07) і інш. гераізаваны вобраз мінулага Швецыі. Палемізаваў з Ю.А.*Стрындбергам* («Распад і ўпадак пралетарскай філасофіі», 1911). Аўтар мемуараў «Калі цвілі каштаны» (апубл. 1941). На бел. мову асобныя яго вершы пераклаў Л.Баршчэўскі. Нобелеўская прэмія 1916.

Тв.: Бел. пер. — [Вершы] // Далягляды, 92. Мн., 1992; Рус. пер. — у кн.: Хейденстам В. фон. Воины Карла XII; Лагерквист П. Улыбка вечности. М., 1994. *Л.П.Баршчэўскі.*

ХЕЙЛ (Hale) Джордж Элеры (29.6.1868, г. Чыкага, ЗША — 21.2.1938), амерыканскі астраном. Чл. Нац. АН ЗША (1902). Замежны чл.-кар. Рас. АН (1924). Скончыў Масачусецкі тэхнал.

В.К.**Хеда**. Нацюрморт. 1633.

ін-т (1890). З 1897 праф. Чыкагскага ун-та. Заснавальнік і першы дырэктар Йеркскай (1895—1905) і Маўнт-Вілсанаўскай (1904—23) абсерваторый. Навук. працы па даследаванні Сонца і зорак. Першы выкарыстаў для назіранняў Сонца спектрагеліяскоп, спектрагеліёграф і вежавы тэлескоп. Прадказаў і пацвердзіў данымі назіранняў існаванне магн. поля сонечных плям (1908).

ХЕ́ЙЛІ (Hailey) Артур (н. 5.4.1920, г. Лутан, Вялікабрытанія), амерыканскі пісьменнік. Дэбютаваў як сцэнарыст. Аўтар серыі «вытворчых» раманаў з жыцця дзелавой Амерыкі, адметных надзённасцю і дынамічным сюжэтам: «Канчатковы дыягназ» (1959), «Атэль» (1965), «Аэрапорт» (1968), «Мянялы» (1975), «Перагрузка» (1979), «Моцнадзейны сродак» (1984) і інш. У іх праблемы сацыяльна-эканам. арг-цыі грамадства, расавай дыскрымінацыі, існавання чалавека ў святле тэхн. прагрэсу. Востраскюжэтны раман «Вячэрнія навіны» (1990) пра амер. тэлебачанне і інтэрнацыянальны тэрарызм. Большасць яго раманаў трапілі ў лік бестселераў, многія экранізаваны.

Тв.: Рус. пер. — Отель. Аэропорт. М., 1978; Аэропорт. Окончательный диагноз. Кишинев, 1980. *Е.А.Лявонава.*

ХЕ́ЙМАНС, Гейманс (Heymans) Карней Джын Францыа (28.3.1892, г. Гент, Бельгія — 18.6.1968), бельгійскі вучоны ў галіне фізіялогіі і фармакалогіі. Ганаровы чл. Лонданскага каралеўскага т-ва, АН Францыі. Скончыў ун-т Гента (1920). Вучыўся ў Парыжы, г. Лазана (Швейцарыя), Вене, Лондане. З 1922 ва ун-це Гента (рэктар). У 1930—63 ва ун-це Хейманса (дырэктар). Навук. працы па праблемах фізіялогіі і фармакалогіі дыхання, цыркуляцыі крыві, метабалізму. Адкрыў хемарэцэптары. Вызначыў ролю рэфлексагенных зон каратыдных сінусаў і аорты ў рэгуляцыі дыхання і кровазвароту. Нобелеўская прэмія 1938. *В.Ф.Ермакоў.*

ХЕ́ЙНМАН Фаіна Барысаўна (н. 21.12.1919, г. Віцебск), бел. вучоны ў галіне марфалогіі нерв. сістэмы. Д-р мед. н. (1973). Скончыла Віцебскі мед. ін-т (1941). З 1953 у Ін-це фізіялогіі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па вызначэнні заканамернасцей інервацыі мочавыводных органаў, распрацоўцы новых спосабаў дыягностыкі і лячэння нейрагенных расстройстваў мочаспускання ў чалавека.

Тв.: Иннервация мочевыводящих органов. Мн., 1973; Восстановление иннервации мочевого пузыря. Мн., 1974 (разам з Д.М.Голубам). *М.К.Туміловіч.*

ХЕЙС, Гейс (Heuss) Стафан, сакратар пасольства «Свяшчэннай Рымскай імперыі» ў Расіі ў 1593. У час падарожжа пасольства з Варшавы праз Вільню ў Маскву вёў дзённік, у якім апісаў бел. гарады і мястэчкі: Гродна, Маладзечна, Лагойск, Барысаў, Начу, Оршу, Дуброўна. Адзначыў спусташэнні, прычыненыя Інфлянцкай вайной 1558—82, даў звесткі пра забудову, замкі, прыродныя ўмовы Беларусі.

Тв.: Рус. пер. — Описание путешествия в Москву Николая Варкоча, посла римского императора, в 1593 г. // Проезжая по Московии: (Россия XVI—XVII вв. глазами дипломатов). М., 1991.

ХЕ́ЙСТЫНГС (Hastings), горад у Вялікабрытаніі, гл. *Гастынгс.*

ХЕ́ЙФЕЦ Леанід Яфімавіч (н. 4.5.1934, Мінск), расійскі рэжысёр, педагог. Нар. арт. Расіі (1993). Скончыў Бел. політэхн. ін-т (1956), студыю пры Бел. т-ры імя Я.Купалы (1961, кіраўнік Л.*Рахленка*), Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва (1963, курс А.*Папова* і М.*Кнебель*). Працаваў у тэатрах Масквы: Сав. Арміі (з 1963), Малым (з 1971), Маст. акад. т-ры імя А.Чэхава (з 1986). У 1988—94 узначальваў Цэнтр. т-р Рас. Арміі. У 1971—80 выкладаў у Тэатр. вучылішчы імя М.Шчэпкіна, з 1980 у Рас. акадэміі тэатр. мастацтва (з 1991 праф.), адначасова з 1995 у Вышэйшым тэатр. вучылішчы імя Б.Шчукіна (заг. кафедры рэжысуры). Яго пастаноўкі адметныя яснасцю рэжысёрскай думкі, фантазіяй, філас. і сац. абагульненнямі, спалучэннем тонкага псіхалагізму з вастрынёй сцэн. формы: «Мой бедны Марат» А.Арбузава (1965), «Дзядзька Ваня» А.Чэхава (1969), «Вяселле Крачынскага» А.Сухаво-Кабыліна (1971), «Кароль Лір» У.Шэкспіра (1979), «Зыкавы» М.Горкага (1985), «Павел I» Дз.Мережкоўскага (1989), «Маскарад» М.Лермантава (1992), «Вішнёвы сад» Чэхава (2001) і інш. На бел. сцэне паставіў «Навальніцу» А.Астроўскага (1975, т-р імя Я.Купалы). Працуе ў т-рах Францыі, Польшчы, Балгарыі, Венгрыі, Турцыі. Дзярж. прэмія Расіі 1991.

Р.І.Баравік.

ХЕ́ЙФЕЦ Міхаіл Львовіч (н. 4.4.1962, г. Полацк Віцебскай вобл.), бел. вучоны ў галіне тэхналогіі машынабудавання. Д-р тэхн. н. (1998), праф. (2000). Скончыў Наваполацкі політэхн. ін-т (1984). З 1989 у Полацкім ун-це. Навук. працы па матэм. мадэліраванні тэхнал. працэсаў, сінергетыцы. Распрацаваў метады абмежавання магутнасці і колькасці тэхнал. уздзеянняў, кіравання адваротнымі сувязямі паміж параметрамі апрацоўкі. Прапанаваў спосабы стварэння вырабаў без формаўтваральнай аснасткі.

Тв.: Математическое моделирование технологических процессов. Новополоцк, 1999; Синергетические аспекты физико-химических методов обработки. Мн., 2000 (у сааўт.). *М.П.Савік.*

ХЕ́ЙФЕЦ (Heifetz) Яша [Іосіф Робертавіч (Рувімавіч); 2.2.1901, Вільнюс — 12.12.1987], амерыканскі скрыпач, педагог. Вучыўся ў Пецярбургскай кансерваторыі ў І.Налбандзяна, Л.*Аўэра*. З 1917 у ЗША. З 1962 выкладаў у Паўд.-Каліфарнійскім ун-це. Яго выканаўчай манеры характэрны віртуознасць, экспрэсія, маст. інтэрпрэтацыя. Першы выканаўца шматлікіх, у т.л. прысвечаных яму, твораў. У рэпертуары класічныя, а таксама забытыя і рэдка выконваемыя творы. Аўтар больш як 100 транскрыпцый для скрыпкі і інш.

К.Дж.Ф.Хейманс.

І.Я.Хейфіц.

ХЕ́ЙФІЦ Іосіф Яфімавіч (17.12.1905, Мінск — 25.5.1995), расійскі кінарэжысёр, сцэнарыст. Нар. арт. СССР (1964). Герой Сац. Працы (1975). Скончыў Ленінградскі тэхнікум экраннага мастацтва (1927). З 1928 на кінастудыі «Ленфільм». У 1930—50 здымаў фільмы з А.Р.*Зархі*: «Гарачыя дзянёчкі» (1935), «Дэпутат Балтыкі» (1937; гал. прыз Міжнар. выстаўкі ў Парыжы), «Член урада» (1940), «Яго імя Сухэ-Батар» (1942, сумесна з Манголіяй), «Разгром Японіі» (1945, дакумент.). Яго самаст. рэжысёрскія работы вызначаюцца мастацтвам выразнай дэталі, адухоўленасцю, увагай да акцёрскай індывідуальнасці, тонкай інтэрпрэтацыяй рус. класікі. Сярод фільмаў: «Вялікая сям'я» (1954), «Справа Румянцава» (1956), «Дарагі мой чалавек» (1958), «Дама з сабачкам» (1960; прыз Міжнар. кінафестывалю ў Кане, Францыя), «Салют, Марыя!» (1970), «Ася» (1978), «Упершыню замужам», «Адзіная» (абодва 1980; за апошні прыз Міжнар. кінафестывалю ў Карлавых Варах, Чэхія), «Шурачка» (1983), «Вандроўны аўтобус» (1990) і інш. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1946.

Тв.: О кино. Л.; М., 1966; Фиолетовый гусь и другие киноистории. [Л., 1970].

Літ.: Петрович А. И.Хейфиц. [М., 1965]. *Л.В.Календа.*

ХЕК СЕРАБРЫ́СТЫ, мерлуза серабрыстая (Merluccius bilinearis), рыба сям. мерлузавых атр. траскападобных. Пашыраны ў Атлантычным ак. каля берагоў Паўн. Амерыкі. Жыве пераважна на глыб. 30—300 м.

Даўж. да 70 см, пераважае даўж. 35 см. Палаваспелы ў 3—4 гады. Нераст парцыённы, з мая па кастрычнік, на глыб. 40—150 м.

Хек серабрысты.

Плоднасць да 400 тыс. ікрынак. Корміцца беспазваночнымі і рыбай. Аб'ект промыслу.

ХЕКМАЦІЯ́Р Гульбедзін (н. 1948, прав. Кундуз, Афганістан), палітычны і дзярж. дзеяч Афганістана. Вучыўся ў Кабульскім ун-це. У 1969 адзін са стваральнікаў радыкальнай ісламісцкай арг-цыі «Мусульманская моладзь». У 1975 удзельнічаў у няўдалым паўстанні Ісламістаў супраць рэжыму М.*Дауда*; пасля паражэння ўцёк у Пакістан, дзе стварыў Ісламскую партыю Афганістана — найбуйнейшую з арг-цый маджахедаў (гл. *Муджахіды*), якія з восені 1978 вялі ўзбр. барацьбу супраць рэжыму *Народна-дэмакратычнай партыі Афганістана* (НДПА), а ў снеж. 1979 — лют. 1989 — і супраць сав. войск. Пасля звяржэння ўлады НДПА (крас. 1992) Х. у 1993—94 і 1996—97 — прэм'ер-міністр Ісламскай Дзяржавы Афганістан. Пасля захопу ў вер. 1996 Кабула *талібамі* эмігрыраваў. *В.У.Адзярыха.*

ХЕЛА́ТНЫЯ ЗЛУЧЭ́ННІ, унутрыкомплексныя злучэнні, клас *комплексных злучэнняў*, у якіх цэнтральны атам (ці іон) звязаны з двума і больш атамамі *ліганду*, у выніку чаго ўтвараецца некалькі гетэрацыклаў. Найб. пашыраны Х.з. металаў. Характарызуюцца высокай устойлівасцю. Некат. Х.з. (хларафіл, гемаглабін, вітамін B_{12} і інш.) адыгрываюць важную ролю ў працэсах жыццядзейнасці. Выкарыстоўваюцца пры аналізе і раздзяленні хім. элементаў, для вывядзення цяжкіх і радыеактыўных металаў з арганізма і інш.

ХЕЛЕ́МСКІ Якаў Айзікавіч (н. 31.1.1914, г. Васількоў Кіеўскай вобл., Украіна), рускі паэт, празаік, перакладчык. Засл. дз. культ. Беларусі (1968). Вучыўся ў Літ. ін-це імя М.Горкага ў Маскве (1933—35). Друкуецца з 1931. Паэт. творы адметныя выразнасцю мовы, глыбінёй пачуцця, добрым гумарам: зб-кі «У дарозе» (1948), «Ветэраны» (1957), «Непарушны запас» (1965), «Чацвёртая ступень» (1977), «Высакосны год» (2001) і інш. Аўтар аповесцей «Вечны падданы паэзіі» (1966), «На цёмнай яліне звонкая жалейка» (1971), «Не даязджаючы да Грэнады» (1976), «Аповесці пра паэтаў» (1980) і інш. Шмат вершаў прысвяціў Беларусі, у т.л. «Люблю паэтаў беларускіх», «Беларускім паэтам», «Няміга». На рус. мову пераклаў паэт. творы П.Броўкі (зб-кі «А дні ідуць...», 1961; «Кляновыя лісты», «Трубі, мой бор!», абодва 1965; «Крокі», 1975), А.Куляшова (зб-кі «Грозная пушча», 1956, «Новая кніга», «З новых вершаў», абодва 1964), М.Танка (зб-кі «Вершы з дарогі», 1958, «Усход зарой палае», 1959), вершы П.Панчанкі, Е.Лось, Р.Барадуліна, Г.Бураўкіна, А.Вялюгіна, Н.Гілевіча, К.Кірэенкі, М.Лужаніна і іншых. Перакладае з інш. моў. На бел. мову асобныя яго вершы пераклалі Броўка, Куляшоў, М.Танк, Панчанка, Барадулін, Х.Жычка, М.Калачынскі, У.Паўлаў, У.Шахавец. За пераклад на рус. мову твораў Броўкі, кн. М.Танка «Нарачанскія сосны» (1977), Куляшова «Хуткасць» (1978, з Н.Кіслікам), Панчанкі «Дзе начуе жаваранак» (1979) Дзярж. прэмія Беларусі імя Я.Коласа 1980.

Тв.: Избранное. М., 1983; Перевожу стихи товарища. Мн., 1962; Лирика. М., 1968; Ключ: Страницы бел. лирики. Мн., 1968; Из года в год. Мн., 1973; Четыре мастера. Мн., 1984; Каботажное плавание. М., 2002.

Я.А.Хелемскі.

Т.Р.Ермаковіч.

ХЕЛІЦЭ́РАВЫЯ (Chelicerata), падтып беспазваночных тыпу членістаногіх. Паходжаннем звязаны з *трылабітамі*. 2 кл.: *мерастомавыя* (жывуць у морах, пераважна выкапнёвыя) і *павукападобныя* (пераважна наземныя сучасныя формы). Каля 54 тыс. сучасных і некалькі тысяч выкапнёвых відаў. Пашыраны ўсюды, акрамя Антарктыды.

Даўж. ад 0,05 мм (некат. кляшчы) да 1,8 м (выкапнёвыя эўрыптэрыды). Цела падзяляецца на галавагрудзі (прасома) і брушка (апістасома). Галавагрудзі маюць 6 пар канечнасцей, з якіх пярэднія (*хеліцэры*) размешчаны наперадзе рота, а ззаду яго — педыпальпы (нагашчупальцы) — пераважна органы пачуццяў, іншы раз удзельнічаюць у перамяшчэнні і захопе корму. Брушныя 4 пары ног рэдукаваныя або ператварыліся ў жабры, лёгкія і інш. органы. Дыхаюць жабрамі, лёгкімі або трахеямі.

ХЕЛІЦЭ́РЫ (ад грэч. chēlē клюшня, кіпцюр + keras рог), першая пара галаўных канечнасцей у *хеліцэравых*. Выкарыстоўваюцца як сківіцы для захопу і раздзірання здабычы. Складаюцца з 2—3 членікаў. Маюць выгляд клюшняў (скарпіёны), кіпцюрападобных членікаў (павукі), стылетаў або кручкоў (кляшчы), адпавядаюць антэнам ракападобных.

ХЕЛМІКО́ЎСКІ (Chełmikowski) Ян (1800?—1873?), польскі акцёр, спявак, антрэпрэнёр. Творчасць звязана з Літвой, Беларуссю і Польшчай. На профес. сцэне дэбютаваў у Вільні ў 1827. Іграў на польскай і рус. мовах. У 1838 у складзе віленскай трупы выступаў у Брэсце (у 1839 кіраўнік трупы). Працаваў у Мінску (1832, 1847—48; у 1841—42, 1844—45 і 1857 антрэпрэнёр Мінскага т-ра), Полацку (1839), Віцебску (1848—49), Гродне (1854—55). У летнія сезоны 1842 і 1861 з трупай акцёраў Мінскага т-ра гастраліраваў у Магілёве. З 1862 акцёр, рэжысёр, антрэпрэнёр у гарадах Польшчы. Выступаў у амплуа палюбоўнікаў, характарных ролях: Пратніцкі («Жарты пажа» А.Кацэбу), Акціч («Дзядзечка ўсяго свету» К.Маераноўскага паводле Р.Бенедыкса), Януш і Густаў («Пан Явяльскі» і «Дзявочыя абяцанні, ці Магнетызм сэрца» А.Фрэдры), Бжэхва («Вусы і парык» Ю.Кажанёўскага); выконваў оперныя партыі: Альфонс і лорд Артур («Фаварытка» і «Лючыя ды Ламермур» Г.Даніцэці). *Ю.А.Пашкін.*

ХЕЛМО́НСКІ (Chełmoński) Юзаф (7.11.1849, с. Бочкі Лодзінскага ваяв., Польшча — 6.14.1914), польскі жывапісец. Вучыўся ў Варшаве ў В.Герсана і ў Рысавальным класе (1867—71), Мюнхенскай АМ (1872—74). У 1875—87 працаваў у Парыжы, пасля ў Польшчы. Раннім творам уласцівы жанравыя замалёўкі сял. жыцця: «Справа ў войта» (1873), «На фальварку» (1875), «Катанне на санях». Пазней вобразы набылі паэтычную абагульненасць, якая раскрывае духоўную прыгажосць сялянства, яго арганічную сувязь з прыродай: «Бабіна лета» (1875), «Перад бурай» (1896). Творы вылучаюцца мяккасцю колеравых градацый, тонкімі эфектамі асвятлення.

Ю.Хелмонскі. Катанне на санях.

ХЕЛМС (Helms) Сьюзен (н. 26.2.1958, г. Чарлстан, ЗША), касманаўт ЗША. Магістр у галіне аэранаўтыкі. Скончыла Акадэмію ВПС ЗША (1980), Станфардскі ун-т (1985), школу лётчыкаў-выпрабавальнікаў (1988). З 1990 у групе касманаўтаў НАСА. Здзейсніла 5 палётаў у складзе экіпажаў касм. караблёў (КК): 13—19.1.1993 — на КК «Індэвар», 9—20.9.1994 — на КК «Дыскаверы»,

20.6—7.7.1996 — на КК «Калумбія», 19—25.5.2000 — на КК «Атлантыс» і Міжнар. касм. станцыі (МКС; як спецыяліст па палётах), 8.3—22.8.2001 — на КК «Дыскаверы» і МКС (як бортінжынер 2-й асн. экспедыцыі). У космасе правяла 211 сут 23 гадз; удзельнічала ў самым працяглым выхадзе ў адкрыты космас (9 гадз; 11.3.2001). 5 медалёў НАСА «За касмічны палёт». *У.С.Ларыёнаў.*

ХЕ́ЛПМЕН (Helpmann) Роберт (9.4.1909, Маўнт-Гамбір, Аўстралія — 1986), англійскі і аўстралійскі артыст балета, балетмайстар, акцёр. Вучыўся ў трупе Г.Паўлавай у Л.Новікава (1926; падчас гастроляў), з 1932 у школе Н. дэ Валуа ў Англіі. У 1934—50 вядучы танцоўшчык трупы «Вік-Уэлс бале» (з 1942 «Седлерс-Уэлс бале») у Вялікабрытаніі. У 1965—75 адзін з маст. кіраўнікоў Аўстрал. балета. Выканаўца вядучых партый у пастаноўках, якія вызначылі фарміраванне англ. балета: паэт і прынц Цемры («Прывіды» і «Дантэ-Саната» на муз. Ф.Ліста), Жаніх («Вясельны букет» Л.Бернерса), Дон Жуан («Дон Жуан» на муз. Р.Штрауса) і інш.; а таксама ў пастаўленых ім балетах. З 1930-х г. выступаў як драм. акцёр: Гамлет, Петручыо («Гамлет», «Утаймаванне свавольніцы» У.Шэкспіра), Клоун («Той, хто атрымлівае аплявухі» Л.Андрэева) і інш. Здымаўся ў кіно. *Л.А.Сівалобчык.*

ХЕЛУА́Н, горад у Егіпце, прыгарад Каіра. 359 тыс. ж. (1991). Прам-сць: металургічная, машынабудаванне (вытв-сць чыг. вагонаў), цэм., шаўковая і інш. Бальнеакліматычны курорт. Абсерваторыя. За 5 км ад Х. — Хелуанскі некропаль (30—28 ст. да н.э.), з шахтавымі грабніцамі з сырцовай цэглы.

ХЕ́ЛЬСІНГБАРГ (Hälsingborg), горад на Пд Швецыі. 110,6 тыс. ж. (1993). Порт у праліве Эрэсун. Чыг. і аўтамаб. паромам злучаны з г. *Хельсінгёр* (Данія). Прам-сць: суднабудаванне, эл.-тэхн., гумава-тэхн., хім., керамічная, харч., каляровая металургія (выплаўка медзі).

ХЕ́ЛЬСІНГЁР (Helsingør), Эльсінар, горад у Даніі, на ПнУ в-ва Зеландыя. 44 тыс. ж. (1986). Порт у праліве Эрэсун. Чыг. і аўтамаб. паромам злучаны з г. *Хельсінгбарг* (Швецыя). Прам-сць: суднабуд., хім., тэкст., харчовая. Каралеўскі замак Кронбарг (16 ст.), месца, дзе адбываліся падзеі, адлюстраваныя ў трагедыі У.Шэкспіра «Гамлет».

ХЕ́ЛЬСІНКІ (Helsinki), Гельсінгфорс (швед. Helsingfors), горад, сталіца Фінляндыі. На Пд краіны, на беразе Фінскага зал. Балтыйскага мора. Адм. ц. ляні Усіма. 551 тыс. ж. (2000). Важны трансп. вузел. Порт. Міжнар. аэрапорт Малмі. Гал. эканам. і культ. цэнтр краіны. Прам-сць: машынабудаванне (суднабудаванне, эл.-тэхн., вытв-сць пад'ёмнага і цэлюлозна-папяровага абсталявання), тэкст., хім., харч., фарфоравая. Метрапалітэн. Ун-т. Музей-крэпасць Суаменліна (*Свеаборг*; 1748), уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*. Алімпійскі стадыён. Музеі: гісторыка-этнагр. на в-ве Сеўрасары (скансэн), нац., гарадскі і мастацкі («Атэнеум»), пошты. Тэатры Фін. нац. опера, фін нац., нац. шведскі.

Засн. 12.6.1550 паводле ўказа швед. караля *Густава I* Вазы. У 1569 атрымаў гар. прывілей. У 1641 перанесены на сучаснае месца. У канцы 17 — пач. 18 ст. горад неаднаразова спустошаны. Адбудаваны ў 1721. Будаўніцтва ў 1748 крэпасці Свеаборг паспрыяла прыпоку насельніцтва і ўмацаванню міжнар. сувязей. Пасля далучэння Фінляндыі да Рас. імперыі (1809) і стварэння Вял. княства Фінляндскага яго сталіца ў 1812 была перанесена з г. Турку ў Х. У 1862 горад злучаны чыгункай з унутр. раёнамі краіны, у 1870 — з С.-Пецярбургам. У канцы 19 ст. Х. сталі важным гандлёва-прамысл. і культ. цэнтрам. Пасля абвяшчэння незалежнасці Фінляндыі (снеж. 1917) — сталіца Фінляндскай рэспублікі. У 2-ю сусв. вайну горад значна пацярпеў. У 1952 у Х. адбыліся XV летнія Алімп. гульні; 1.8.1975 тут падпісаны *Заключны акт Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе.*

У 2-й пал. 18 ст. горад пашырыўся за кошт швед. крэпасці Свеаборг. З 19 ст. яго забудова вялася паводле рэгулярнага плана (1808—17, кіраўнік І.А.Эрэнстрэм). У сістэму ансамбляў гіст. цэнтра ўваходзяць адкрытая да мора Гандлёвая і замкнёная Сенацкая плошчы. У старым Х. дамінуюць класіцыстычныя пабудовы: Палац прэзідэнта рэспублікі (1814, арх. П.Гранстэт), будынкі муніцыпалітэта (1817—18), б. сената (1818—22), ун-та (1828—32) з абсерваторыяй (1831—33) і б-кай (1831—45), сабор св. Мікалая (1830—52), «Старая клініка» мед. ф-та (1830—38, усе арх. К.Л.*Энгель*). Сярод значных будынкаў 2-й пал. 19 ст.: «Рыцарскі дом» (1856—62, арх. Г.Хівітц), б. Дом саслоўяў (1888, арх. Г.Нюстрэм), маст. музей Атэнеум (1885—87, арх. К.Хёер), дзярж. архіў (1886, арх. Нюстрэм) і інш. Інтэнсіўным буд-вам пазначаны перыяд рамантызму (1900—14): Фін. нац. т-р (1901, арх. О.Тар'яне), з прыбудовай (1954, арх. К. і Х. Сірэн), Цэнтр. вакзал (1904—14, арх. Э.Саарынен і інш.), будынак тэлефоннай кампаніі (1905—09, арх. Л.Сонк), Нац. музей (1906—09, арх. Саарынен, Г.Гезеліус, А.Ліндгрэн), царква ў раёне Каліо (1909—12, арх. Сонк). У 1920—30-я г. пабудаваны універмаг Стокмана (арх. С.Фростэрус), паштамт (арх. Э.Ліндрас, І.Ярві), парламент (арх. І.Сірэн). Дасягненне фін. горадабудаўніцтва 20 ст. — план Вял. Х. (1915—18, арх. Саарынен). Вылучаюцца комплексы Алімп. стадыёна (1934—40, дабудаваны ў 1952, арх. І.Ліндэгрэн, Т.Янты) і Алімп. вёскі (1938—40, арх. Х.Экелунд, М.Вялікангас), гасцініца «Палас» з гандл. памяшканнямі (1949—52, арх. В.*Рэвель*, з К.Пецяя), новы корпус ун-та (1953—58, арх. А.Эрві), падземная царква Тайвалахты (1965—69, арх. Т. і Т. Суамалайнен), палац «Фінляндыя» (1967—71), Дом кнігі (1970, абодва арх. А.*Аалта*), парк з помнікам Я.Сібеліусу (1961—67, скульпт. Э.Хілтунен), фантаны «Хавіс Аманда» (1907, скульпт. В.Валгрэн) і «Айна» (1912, скульпт. Э.Вікстрэм), аўтаномныя раёны Х. — Тапіяла і Отаніемі.

Н.К.Мазоўка (гісторыя і архітэктура).



Хельсінкі. Крэпасць Суаменліна (Свеаборг; 1748).

ХЕ́ЛЬСІНКСКІ ПРАЦЭ́С, палітыка *разрадкі* міжнар. напружанасці ў 1970-я і 1986—91 г. Пачаўся ў 1973—75 з міжнар. перагавораў у г. Хельсінкі (адсюль назва) і падпісання паводле іх вынікаў *Заключнага акта Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе*. У ходзе разгортвання Х.п. Нарада па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе ў 1990-я г. пераўтварылася ў *Арганізацыю па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе.*

ХЕ́ЛЬСІНКСКІЯ ГРУ́ПЫ па правах чалавека ў СССР, грамадскія ініцыятыўныя непалітычныя аб'яднанні па абароне *правоў чалавека* ў Сав. Саюзе, якія існавалі ў 1976—81. Дзейнічалі паўлегальна на падставе гуманіт. артыкулаў *Заключнага акта Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе* (Хельсінкскі акт — адсюль назва). Гл. ў арт. *Праваабарончы рух у СССР, Дысідэнты.*

Хельсінкі. Сабор святога Мікалая.

ХЕ́ЛЬЧЫЦКІ (Chelčický) Пётр (каля 1390 — каля 1460), ідэолаг памяркоўных *табарытаў* Чэхіі ў час *гусіцкіх войнаў* 1-й пал. 15 ст. У сваіх творах (на чэш. мове) крытыкаваў феад. лад, выступаў за стварэнне грамадства, засн. на роўнасці і абавязковай працы ўсіх яго членаў, супраць царк. іерархіі, багацця і паліт. улады каталіцкай царквы (ідэальнай царквой лічыў абшчыну вернікаў на чале з выбарным святаром). Ідэі Х. паўплывалі на абшчыны *Чэшскіх братоў*.

ХЕМА... (ад познагрэч. chēmeia хімія), першая састаўная частка складаных слоў, якая адпавядае паняццям «хімія», «хімічны» (напр., *хемасінтэз, хемастэрылянты, хематроніка*).

ХЕМАГЕ́ННЫЯ АДКЛА́ДЫ (ад *хема... + ...ген*), хімічныя адклады, горныя пароды, утвораныя на дне вадаёмаў з растворaў у выніку хім. і біяхім. рэакцый або змен т-ры вады. Напр., раствaральныя солі (галіт, карналіт і інш.), гіпс, ангідрыт, даламіт, яшма, джэспіліт, некаторыя вапнякі і інш. Гл. таксама *Асадкавыя горныя пароды.*

ХЕМАРЭЦЭ́ПТАРЫ (ад *хема... + рэцэптары*), адчувальныя клеткі або іх структуры, праз якія арганізм успрымае значныя для жыццядзейнасці хім. рэчывы. Адрозніваюць Х. ўнутр. і вокнавыя. Унутр. — адчувальныя да хім. кампанентаў крыві і інш. унутр. асяроддзяў арганізма. Вонкавыя (смакавыя і нюхальныя рэцэптарныя клеткі, таксама свабодныя нерв. канцы ў покрывах цела) успрымаюць знешнія раздражняльнікі (ваганні pH і іоннага саставу воднага асяроддзя, газавага саставу паветра, наяўнасць ядавітых і інш. рэчываў). У малекулярнай біялогіі Х. — спецыялізаваныя макрамалекулярныя структуры на паверхні клетак, якія ўзаемадзейнічаюць з малекуламі хім. раздражняльнікаў. Гл. таксама *Нюх, Хемарэцэпцыя.*

ХЕМАРЭЦЭ́ПЦЫЯ (ад *хема... + лац.* receptio прыняцце), успрыманне аднаклетачным арганізмам або *хемарэцэптарамі* многаклетачнага арганізма значных для яго жыццядзейнасці хім. рэчываў. Уласціва ўсім жывым арганізмам. Першасны працэс Х. — узаемадзеянне малекул хім. раздражняльніка з хемарэцэптарным бялком, што знаходзіцца ў клетачнай мембране. У большасці жывёл адрозніваюць інтэрахемарэцэпцыю, якая забяспечвае аналіз унутр. асяроддзя арганізма (у т.л. рэцэпцыю гармонаў, медыятараў і інш.), і экстэрахемарэцэпцыю (успрыманне вонкавых хім. раздражняльнікаў). Вылучаюць таксама маласпецыялізаваны тып Х. — агульнае хім. пачуццё, якое забяспечвае адчувальнасць покрыва цела да раздражняльных рэчываў. Мае важнае значэнне для большасці жывёл пры пошуку ежы, палавога партнёра, арыентацыі ў прасторы і інш. Асабліва вял. ролю Х. адыгрывае ў жыцці насякомых, дзе яна вызначае большасць фізіял. і паводзінскіх рэакцый.

ХЕМАСІ́НТЭЗ (ад *хема... + сінтэз*), працэс утварэння некат. бактэрыямі арган. рэчываў з двухвокісу вугляроду за кошт энергіі, атрыманай пры акісленні неарган. злучэнняў (аміяку, вадароду, злучэнняў серы і інш.). Адкрыты С.М.*Вінаградскім* у 1887. Хемасінтэтычным бактэрыям належыць важная роля ў *біягеахімічным кругавароце рэчываў*. Многія працэсы ператварэння хім. элементаў у біягеахім. цыклах ажыццяўляюцца толькі арганізмамі, здольнымі да Х.

ХЕМАСО́РБЦЫЯ (ад *хема... + сорбцыя*), паглынанне рэчыва паверхняй цвёрдага цела (хемасарбента). Адбываецца ў выніку ўтварэння хім. сувязі паміж іх малекуламі. Можа спалучацца з абарачальным працэсам — *дэсорбцыяй*.

Суправаджаецца вылучэннем значнай колькасці цеплаты, што замаруджвае дэсорбцыю і робіць Х. практычна неабарачальнай. Характэрная асаблівасць Х. — адчувальнасць да хім. паходжання паглынальніка (хемасарбента) і чысціні паверхні. Цвердафазную і вадкасную Х. ажыццяўляюць у калонных апаратах, на эфектыўнасць працэсу ўплываюць іх тып, канструкцыя і гідрадынамічныя ўмовы работы. Выкарыстоўваюць для раздзялення газавых сумесей, пры ачыстцы газаў ад вышэйшых вуглевадародаў, сярністых злучэнняў і інш., у электравакуумнай тэхніцы.

ХЕМАСТЭРЫЛЯ́НТЫ (ад *хема... + лац.* sterilis бясплодны), хімічныя рэчывы са стэрылізавальным дзеяннем. У якасці Х. для стэрылізацыі насякомых выкарыстоўваюць антыметабаліты (парушаюць сінтэз нуклеінавых к-т, абменныя працэсы), алкілавальныя рэчывы (выклікаюць парушэнні ў храмасомах), некат. антыбіётыкі, алкалоіды і інш. У выніку большасць шкоднікаў адкладваюць нежыццяздольныя яйцы. Выкарыстоўваюцца ў барацьбе са шкоднымі насякомымі (малярыйным камаром, яблыневай пладажэркай, тараканамі і інш.).

ХЕМАТРАПІ́ЗМ [ад *хема... + трапізм(ы)*], роставая рухальная рэакцыя органаў раслін (выгінанне) на градыент хім. рэчыва, таксама на градыент вільготнасці (*гідратрапізм*), кіслароду (аэратрапізм). Назіраецца ў гіфаў грыбоў, пылкавых трубак раслін і інш.

ХЕМАТРО́НІКА, навукова-тэхнічны кірунак распрацоўкі і выкарыстання прылад і прыстасаванняў, прынцып дзеяння якіх заснаваны на электрахім. працэсах і з'явах, што адбываюцца на мяжы электрод—электраліт пры працяканні эл. току. Хематронныя прылады вызначаюцца высокай адчувальнасцю, малой спажывальнай магутнасцю, нізкім узроўнем шумоў і высокай надзейнасцю. Выкарыстоўваюцца ў аўтаматыцы, вымяральнай і выліч. тэхніцы і інш., як мініяцюрныя ўзмацняльнікі, выпрамнікі, інтэгратары, рэле часу, функцыянальныя пераўтваральнікі, індыкатары і інш.

ХЕМІЛЮМІНЕСЦЭ́НЦЫЯ, выпрамяненне, якое ўзнікае пры ўтварэнні прадуктаў хім. рэакцый ва ўзбуджаным стане; адзін з відаў *люмінесцэнцыі*. Пры квантавым пераходзе малекул у асн. стан энергія ўзбуджэння выпрамяняецца ў выглядзе квантаў святла; Х. ў інфрачырв., бачнай і ультрафіялетавай ч. спектра суправаджае газа- і вадкафазныя, гетэрагенныя рэакцыі. Асобны выпадак Х. — *біялюмінесцэнцыя*. Выкарыстоўваюць Х. пры вывучэнні механізмаў складаных рэакцый, працэсаў у біял. сістэмах, у хемілюмінесцэнтных крыніцах святла і інш.

ХЕМІНГУЭ́Й (Hemingway) Эрнэст Міллер (21.7.1899, г. Оук-Парк, штат Ілінойс, ЗША — 2.7.1961), амерыканскі пісьменнік. У 1922—28 жыў у Парыжы, у 1939—60 на Кубе. Шмат падарожнічаў. Літ. дзейнасць пачаў як журналіст (1917). У раманах «І ўзыходзіць сонца» (1926, у рус. пер. «Фіеста»), «Бывай, зброя!» (1929), зб. апавяд. «Мужчыны без жанчын» (1927; у т.л. «Няскораны», 1926) выступіў як прадстаўнік т.зв. страчанага пакалення, духоўны крызіс якога звязаны з 1-й сусв. вайной. У лірычных адступленнях кніг нарысаў

«Смерць пасля поўдня» (1932) і «Зялёныя пагоркі Афрыкі» (1935) выказаў свае этычныя, эстэт. і грамадскія погляды. У рамане «Мець і не мець» (1937) вострыя сац. праблемы. Іспанская тэма ў драме «Пятая калона» (1938), рамане «Па кім звоніць звон» (1940). Мужнасць і непахіснасць простага чалавека ў змаганні з прыродай у аповесці-прытчы

Э.М.Хемінгуэй.

Ф.Ш.Хенч.

«Стары і мора» (1952). Аўтар зб. апавяд. «Пераможца не атрымлівае нічога» (1933), кн. ўспамінаў «Свята, якое заўсёды з табою» (выд. 1964), незавершанага рамана «Астравы ў акіяне» (выд. 1970), шматлікіх апавяданняў, рэпартажаў, кінасцэнарыяў і інш. Майстар дыялога і ўнутр. маналога. Яго творы адметныя драматызмам, экспрэсіўнасцю, сугестыўнасцю аповеду з глыбокім падтэкстам, насычаны біблейскімі матывамі і вобразамі-сімваламі. На бел. мову творы Х. пераклалі А.Асташонак, М.Валошка, Ю.Гаўрук, П.Марціновіч, Я.Міклашэўскі, В.Небышынец. Нобелеўская прэмія 1954.

Тв.: Бел. пер. — І ўзыходзіць сонца (Фэст). Мн., 1976; Па кім звоніць звон. Мн., 1991; Стары чалавек і мора // Олдрыдж Дж. Паляўнічы; Хемінгуэй Э. Стары чалавек і мора; Сент-Экзюперы А. Планета людзей. Маленькі прынц. Мн., 1996; Бывай, зброя! Мн., 1996; Рус. пер. — Собр. соч. Т.1—4. М., 1981—82; Репортажи. М., 1969; Оставаться самим собой: Избр. письма (1918—61). М., 1983; Старый газетчик пишет...: Худож. публицистика. М., 1983.

Літ.: Кашкин И.А. Эрнест Хемингуэй: Критико-биогр. очерк. М., 1966; Грибанов Б.Т. Хемингуэй. М., 1971; Ягодкин В. Хемингуэй: герой и время. М., 1980; Анастасьев Н.А. Творчество Э.Хемингуэя. М., 1981; Фуэнтес Н. Хемингуэй на Кубе: Пер. с исп. М., 1988; Эрнест Хемингуэй: Биобиблиогр. указ. М., 1970. *Е.А.Лявонава.*

ХЕ́МНІЦ (Chemnitz), горад у Германіі, на р. Хемніц. У 1953—90 наз. Карл-Маркс-Штат (Karl-Marx-Stadt). Засн. ў 12 ст. 291 тыс. ж. (1991). Буйны прамысл. цэнтр і трансп. вузел. Прам-сць: машынабудаванне (у тл. вытв-сць абсталявання для тэкст. і хім. прам-сці, станкоў, матацыклаў і інш.), трыкат., швейная, мэблевая. Арх. помнікі 12—18 ст.

ХЕМНІ́ЦАР Іван Іванавіч (6.1.1745, Енатаеўская крэпасць, цяпер Архангельская вобл. — 30.3.1784), рускі паэт-байкапісец. Чл. Рас. акадэміі (1784). З сям'і выхадцаў з Саксоніі. Служыў у рас. арміі. З 1782 рас. генерал-консул у г. Смірна. У байках (кн. «Байкі і казкі N.N. у вершах», 1779; «Байкі і казкі І.І.Хемніцара», ч. 1—3, 1799) высмейваў норавы і фанабэрыстасць памешчыкаў, карысталюбства чыноўнікаў і інш. грамадскія заганы.

Тв.: Полн. собр. стихотворений. М.; Л., 1963.

ХЕНАМЕ́ЛЕС, японская айва (Chaenomeles), род кветкавых раслін сям. ружакветных. 4 віды. Пашыраны ў Кітаі і Японіі. На Беларусі інтрадукаваны Х.Маўлея, або айва нізкая (Ch. maulei), і Х. японскі, або айва японская (Ch. japonica).

Лістападныя ці паўвечназялёныя кусты або невял. дрэвы выш. 1—6 м, звычайна калючыя. Скурыстае лісце чаргаванае, простае, пілаватае ці гародчатае па краі. Кветкі адзіночныя або ў пакарочаных гронках, буйныя (дыям. 3—5 см), чырв., ружовыя, белыя, раскрываюцца перад ці адначасова з распусканнем лісця. Плод — яблыкападобны, ядомы. Лісце і плады айвы японскай маюць вітамін С. Пладовыя, дэкар. расліны.

Хенамелес Маўлея.

ХЕНАТЭ́КА (Chaenotheca), род накіпных лішайнікаў сям. каліцыевых. 23 віды. Пашыраны ўсюды. На Беларусі 9 відаў Х.: воласападобная (Ch. trichialis), залатагаловая (Ch. chrysocephala), картузіянская (Ch. carthusiae, занесеная ў Чырв. кнігу), парошыстая (Ch. stemonea), цёмнагаловая (Ch. phaeocephala), іржавая (Ch. ferruginea) і інш. Трапляюцца на старых дрэвах, гнілой драўніне, расл. рэштках.

Хенатэка картузіянская.

Слаявіна зярністая, парашкападобная, бародаўчатая, зрэдку сарэдыёзная, ад белаваташэрай да жоўта-зялёнай. Пладовыя целы (*апатэцыі*) на ножках, часам сядзячыя. Сумкі цыліндрычныя, 8-споравыя. Споры аднаклетачныя, шарападобныя, цёмныя.

Н.М.Кобзар.

ХЕНГ САМРЫ́Н (н. 25.5.1934, в. Как, Камбоджа), палітычны і дзярж. дзеяч Камбоджы (у 1976—89 Кампучыя). Чл. Нар. (да 1991 Нар.-рэв.) партыі Камбоджы з 1959; чл. яе Выканкома (з 1977), ген. сакратар (1981—91), ганаровы старшыня (з 1991) ЦК. Удзельнік узбр. барацьбы супраць праамер. рэжыму ген. Лон Нола (з 1970), пасля яго падзення (1975) у арміі рэжыму «*чырвоных кхмераў*»: палітыкамісар і камандзір дывізіі, нам. нач. штаба Усх. ваен. зоны (1976—78). У 1978 узначаліў паўстанне вайск. часцей (падтрымана в'етн. войскамі) супраць улады *Пол Пота*. З канца 1978 старшыня ЦК Адзінага фронту нац. выратавання Кампучыі. Старшыня Нар. рэв. савета (1979—81), Дзярж. савета (1981—91) Камбоджы. Ва ўмовах фактычнага кантролю В'етнама над краінай і зацяжной грамадз. вайны з прыхільнікамі Пол Пота праводзіў курс на пабудову сацыялізму на в'етн. ўзор.

ХЕНДЖ (англ. henge), від рытуальных помнікаў, якія сустракаюцца толькі на Брытанскіх а-вах. Складаюцца з акруглай прасторы ад 150 да 1700 футаў (ад 45,7 да 518,16 м) у дыяметры, абмежаванай ровам, са знешняга боку якога насыпаны вал. Бываюць з адным уваходам ці з двума (адзін насупраць другога). Некат. Х. маюць пахаванні, ямы, колы з вертыкальна пастаўленых камянёў (напр., *Стонхендж, Эўбюры*), слупы (Вудхендж і інш.).

ХЕ́НІ (Henie) Соня (8.4.1912, Осла — 12.10.1969), нарвежская спартсменка (фігурнае катанне на лёдзе). Чэмпіёнка II, III і IV зімовых Алімп. гульняў (1928, г. Санкт-Морыц, Швейцарыя; 1932, г. Лейк-Плэсід, ЗША; 1936, г. Гарміш-Партэнкірхен, Германія); чэмпіёнка свету (1927—36), Еўропы (1931—36). З 1936 салістка Галівудскага балета на лёдзе (ЗША). У 1936—45 знялася ў 10 кінафільмах у Галівудзе. Заснавальніца (разам з мужам) музея сучаснага мастацтва (1968, паблізу Осла).

А.М.Петрыкаў.

ХЕ́НРЫ, Хенрай (Henri) Роберт (25.6.1865, г. Цынцынаты, ЗША — 12.7.1929), амерыканскі мастак, заснавальнік амер. рэалізму 20 ст. Вучыўся ў Пенсільванскай АМ у Філадэльфіі (1885—88), акадэміі Жуліяна і Школе прыгожых мастацтваў у Парыжы (1888—90). У 1891—95 працаваў у Філадэльфіі, у 1895—99 у Еўропе, пазней у Нью-Йорку. Чл. групы «Васьмёрка», заснавальнік рэаліст. «школы смеццевай

скрынкі» і настаўнік гал. яе прадстаўнікоў. Сярод твораў: «Хлопчык смяецца» (1907), «Маскарадная сукенка» (1911).

ХЕ́НЦЭ (Henze) Ханс Вернер (н. 1.7.1926, г. Гютэрсла, Германія), нямецкі кампазітар. Чл.-кар. АМ ГДР (1968), ганаровы чл. Лонданскай каралеўскай акадэміі музыкі (1975). Вучыўся ў В.Фортнера, Р.Лейбавіца. З 1953 у Італіі. Выкарыстоўвае розныя віды сучаснай кампазіцыйнай тэхнікі. Аўтар опер «Кароль-Алень» (паст. 1956), «Элегія маладым закаханым» (паст. 1961), «Малады лорд» (паст. 1965), «Сёмы крыж» (паст. 1998); балетаў «Ідыёт» (паст. 1952), «Салавей імператара» (паст. 1959); сімф. і камерных твораў. Выступае як дырыжор і муз. крытык.

Літ.: Geitel K. H.W.Henze. Berlin, 1968.

ХЕНЧ (Hench) Філіп Шоўалтэр (28.2.1896, г. Пітсбург, ЗША — 30.3.1965), амерыканскі ўрач-рэўматолаг. Скончыў мед. школу Пітсбургскага ун-та (1920). З 1923 у клініцы Мэё. З 1928 (з 1947 праф.) ва ун-це Мінесоты (г. Рочэстэр). Навук. працы па вывучэнні ролі эндакрынных фактараў у клініцы рэўматычных захворванняў; для лячэння выкарыстоўваў гармоны кары надныркавых. Нобелеўская прэмія 1950 (з Э.К.*Кендалам* і Т.*Рэйхштэйнам*).

В.Ф.Ермакоў.

ХЕО́ПС (грэч. Cheops), Хуфу (егіп.), егіпецкі фараон пач. 27 ст. да н.э. Захаваліся рэшткі летапісу часоў яго праўлення, наскальны барэльеф, на якім адлюстравана перамога Х. над бедуінамі ў Вадзі-Магхара (раён медных рудзнікоў і бірузовых капальняў на Сінайскім п-ве). Імя Х. выяўлена ў дыярытавых каменаломнях на Пн Нубіі на ПнЗ ад *Абу-Сімбела*. *Геродот* у апісанні стараж.-егіп. традыцый пра буд-ва пірамід характарызуе Х. як дэспата, які прымусіў усё насельніцтва Егіпта працаваць на сябе, загнаўшы краіну ў бедства. Піраміда Х. ў Гізе — найбуйнейшая з егіп. пірамід.

ХЕРА́СКАЎ Міхаіл Мацвеевіч (5.11.1733, г. Пераяслаў-Хмяльніцкі, Кіеўская вобл., Украіна — 9.10.1807), рускі пісьменнік. Скончыў Сухапутны шляхецкі корпус у Пецярбургу (1751). У 1763—1802 (з перапынкамі) дырэктар, потым куратар Маскоўскага ун-та. У творчасці Х. — буйнейшага прадстаўніка рус. класіцызму — абазначыўся рух да сентыменталізму. Эпічная паэма «Расіяда» (1779) — пра заваяванне Іванам IV Казанскага ханства. Лірыка Х. разнастайная па жанрах, медытатыўная, прапаведуе ўмеранасць, ціхае жыццё на ўлонні прыроды. Аўтар філас.-павучальных раманаў «Нума Пампілій, або Працвітаючы Рым» (1768), «Кадм і Гармонія» (1786), трагедыі «Венецыянская манахіня» (1758), камедыі «Ненавіснік» (1779), «слёзных драм» «Сябар няшчасных» (1774) і «Мілана» (1798), паэм «Храм Славы» (1761), «Сусвет» (1790) і «Пілігрымы» (1795), паэмы-казкі «Бахарыяна» (1803) і інш.

Тв.: Избр. произв. Л., 1961.

ХЕ́РЛІЧКА, Герлічка, мастак 18 ст. У 1784 размаляваў інтэр'еры залаў і пакояў у Нясвіжскім палацы.

ХЕ́РМЕСАВЫЯ, надсямейства насякомых; гл. ў арт. *Тлі*.

ХЕРСАНЕ́С ТАЎРЫ́ЧАСКІ (грэч. Chersonēsos, у сярэднія вякі Херсон, Корсунь), старажытны горад у Крыме (цяпер у межах г. Севастопаль). Засн. ў 422—421 да н.э. грэкамі-перасяленцамі з Гераклеі Пантыйскай. У 5—1 ст. да н.э. *полі́с*, у 1—4 ст. н.э. — арыстакратычная рэспубліка. Насельніцтва горада займалася рыбалоўствам, вінаградарствам, рамяством і гандлем (пераважна хлебам). У 4—3 ст. да н.э. пад яго кантролем знаходзіліся гарады *Керкінітыда*, Калос-Лімен і шэраг умацаванняў. У гэты час горад займаў плошчу каля 27 га, меў акропаль, агору, каля 20 тыс. жыхароў. У канцы 2 ст. да н.э., каб адбіцца ад *скіфаў*, горад прызнаў панаванне *Пантыйскага царства*. З 63 да н.э. залежаў ад Рыма, з канца 4

Да арт. **Херсанес Таўрычаскі**. Руіны стараж. Херсанеса. Сучасны выгляд.

ст. н.э. — ад Візантыі. Найб. росквіту дасягнуў у 5—пач. 7 ст., калі адноўлены ўмацаванні, пабудаваны буйныя базілікі. У 5—11 ст. Х.Т. — самы вялікі горад Паўн. Прычарнамор'я, цэнтр распаўсюджвання хрысціянства. У пач. 8 ст. падпарадкаваны хазарамі. У 989 быў захоплены войскамі кіеўскага кн. Уладзіміра Святаславіча. Апошні перыяд росквіту — 2-я пал. 9—12 ст.: пашыраны порт, будаваліся новыя храмы, выпускаліся ўласныя грошы. У сярэдзіне 12 ст. трапіў пад уладу полаўцаў, з пач. 13 ст. — Трапезундскай імперыі. У 1299 разбураны ханам *Нагаем*, у канцы 14 ст. — *Едыгеем*. Археал. раскопкамі (пачаты ў 1827, сістэматычныя з 1876) выяўлены муры, вежы, кварталы з дамамі і майстэрнямі, ант. тэатр, больш за 50 хрысц. храмаў (4—15 ст.), некропаль і інш.; эпіграфічныя помнікі — прысяга херсанесцаў (пач. 3 ст. да н.э.), дэкрэты ў гонар Дыяфанта (канец 2 ст. да н.э.), фрагменты жывапісу, мазаікі і інш.

Літ.: Якобсон А.Л. Раннесредневековый Херсонес. М.; Л., 1959; Белов Г.Д. Херсонес-Корсунь. Л., 1969; Кадеев В.И. Херсонес Таврический: Быт и культура (I—III вв. н.э.). Харьков, 1996; Соломоник Э.И. Латинские надписи Херсонеса Таврического. М., 1983; Сапрыкин С.Ю. Гераклея Понтийская и Херсонес Таврический. М., 1986; Зубарь В.М., Павленко Ю.В. Херсонес Таврический и распространение христианства на Руси. Киев, 1988; Пальцева Л.А. Херсонес Таврический в V—I вв. до н.э. Л., 1988; Византийская Таврика. Киев, 1991; Соколов Г.И. Ольвия и Херсонес. М., 1999.

А.Г.Зельскі.

ХЕРСО́Н, горад, цэнтр Херсонскай вобл., на Украіне; на р. Дняпро, каля яго ўпадзення ў Дняпроўскі ліман Чорнага мора. Засн. ў 1778 на месцы ваен. ўмацавання, вядомага з 1743. 350 тыс. ж. (2001). Марскі і рачны порт. Чыг. вузел. Прам-сць: машынабудаванне і металаапрацоўка (суднабудаванне і суднарамонт, с.-г., эл.-тэхн. і інш.), лёгкая, у т.л. баваўняная, харч. (кансервавая, мясная, рыбная), нафтаперапр., выт-сць буд. матэрыялаў. 3 ВНУ. 2 тэатры. Музеі: маст., краязнаўчы. Арх. помнікі: арсенал, Пецярбургскія і Ачакаўскія брамы Херсонскай крэпасці (18 ст.), Грэка-Сафіеўская царква (1780), Екацярынінскі сабор (1786).

ХЕРСО́НСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ. Размешчана на Пд Украіны; абмываецца Чорным і Азоўскім морамі. Утворана 30.3.1944. Пл. 28,5 тыс. км². Нас. 1210

Мікрараён **Херсона**.

тыс. чал. (2001), гарадскога 60%. Цэнтр — г. *Херсон*. Найб. гарады: Каховка, Новая Каховка, Генічаск, Скадоўск, Берыслаў.

Берагавая лінія парэзана залівамі і лімanамі (Дняпроўскі ліман, Сіваш, Ягарлыцкі, Тэндраўскі, Джарылгацкі заліvы). Шмат астравоў. Уздоўж узбярэжжа распасцірающца косы: Тэндраўская, Кінбурнская, Арабацкая Стрэлка. Большая ч. тэр. ў межах Прычарнаморскай нізіны (выш. каля 100 м). Паверхня парэзана далінамі рэк, ярамі. Карысныя выкапні: мінер. буд. матэрыялы (пясок, гліна, вапнякі), солі Сіваша, торф, лекавыя гразі. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад -3 да -5 °С, ліп. 21—23 °С. Ападкаў 300—400 мм за год. Гал. рака — Дняпро. Кахоўскае вадасховішча. Глебы на Пн чарназёмныя, на Пд — цёмна-каштанавыя і каштанавыя. Стэпы пераважна разараныя, невял. ўчасткі дрэвава-хмызняковай расліннасці. Запаведнікі Асканія-Нова і Чарнаморскі; Азова-Сівашская запаведна-паляўнічая гаспадарка.

Х.в. — індустр.-агр. рэгіён. Развіты машынабудаванне і металаапрацоўка (судны, суднарамонт, камбайны, карданныя валы, электразварачнае абсталяванне, электрарухавікі), электраэнергетыка (Кахоўская ГЭС і Херсонская ЦЭЦ), нафтаперапр., дрэваапр. і цэлюлозна-папяровая, лёгкая (баваўняная, швейная, гарбарна-абутковая), харч. (кансервавая, мясная, малочная, масласыраробная, алейная, рыбная) прам-сць; выtв-сць буд. матэрыялаў. Сельская гаспадарка шматгаліновая. Пасяўныя пл. займаюць 1277 тыс. га (2000), каля $^1/_3$ арашаецца. Кахоўская арашальная і Інгулецкая арашальна-абводняльная сістэмы, Паўн.-Крымскі канал. Перавашы, айва, чарэшні). Вінаградарства. Асн. галіны жывёлагадоўлі — мяса-малочная жывёлагадоўля, свіна- і птушкагадоўля, танкарунная авечкагадоўля. Шаўкаводства. Рыбалоўства на Чорным і Азоўскім м., рэках Дняпро і Інгулец. Даўж. чыгункі 456 км, аўтадарог з цвёрдым пакрыццём каля 5 тыс. км. Гал. чыгункі: Херсон—Днепрапятроўск, Херсон—Джанкой—Сімферопаль, Херсон—Мікалаеў, аўтамагістраль Масква—Сімферопаль. Суднаходства па р. Дняпро. Марскія парты: Херсон, Скадоўск, Генічаск. Па тэр. Х.в. праходзяць амія-каправод Тальякі—Адэса, газаправод Шабялінка—Адэса, нафтаправод Крамянчуг—Херсон. Курорты: Голая Прыстань, Скадоўск; курортная мясцовасць — Арабацкая Стрэлка.

Х'ЕРУЛЬФ, К'ерульф (Kjerulf) Хальфдан (17.9.1815, Осла — 11.8.1868), нарвежскі кампазітар, піяніст, дырыжор, педагог; адзін з заснавальнікаў нарв. кампазітарскай школы. У 1845—49 маст. кіраўнік мужчынскага хору Студэнцкага т-ва, у 1857—59 — сімф. абанементных канцэртаў у Осла. Буйн. папярэднік Э.*Грыга*. Для яго музыкі характэрны нац. рамант. каларыт, лірызм, прыгажосць мелодый. Стваральнік нарв. нац. раманса (каля 200). Сярод інш. твораў хары, фп. п'есы, апрацоўкі нар. мелодый і інш. Аўтар муз.-крытычных артыкулаў.

Літ.: Григ Э. Хальфдан Хьерульф // Григ Э. Избр. статьи и письма. М., 1966.

ХЕРУ́СКІ (лац. Cherusci), германскае племя. Паводле Тацыта, Х. жылі па берагах сярэдняга цячэння р. Везер і яе прытокаў; межы іх паселішчаў даходзілі да р. Эльба. У 11 і 9 ст. да н.э. згаданы ўварванні ў валоданні Х. армій Друза і *Тыберыя*. У 4 н.э. заваяваны рымлянамі. У 9 у Тэўтабургскім лесе (тэр. на ПнЗ Германіі паміж далінамі рэк Везер і Эмс) паўстаўшыя Х. на чале з *Арміні́ем* разам з інш. герм. плямёнамі ў выніку чатырохдзённай бітвы знішчылі 3 рым. легіёны на чале з палкаводцам *Варам*. Унутр. разлад і войны з суседнімі плямёнамі прывялі да заняпаду Х., пасля 21 частка іх тэр. падпарадкавана хатамі. У 4 ст. рэшткі Х. увайшлі ў склад *саксаў*. *А.Г.Зельскі.*

ХЕ́РШБАХ (Herschbach) Дадлі Роберт (н. 18.6.1932, г. Сан-Хасэ, ЗША), амерыканскі фізікахімік. Чл. Нац. АН ЗША (1967), Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1964). Скончыў Гарвардскі ун-т (1958), дзе і працаваў з 1963 (у 1977—80 дэкан ф-та). Навук. працы па малекулярнай дынаміцы хім. рэакцый, па ўдасканаленні метаду малекулярных пучкоў. Распрацаваў метады разліку энергет. узроўняў унутрымалекулярнага вярчэння. Вынайшаў метад перакрыжаваных малекулярных пучкоў, які дазваляе вывучаць узаемадзеянне малекул у час хім. рэакцыі. Нац. навук. медаль ЗША (1991). Нобелеўская прэмія 1986 (з *Лі Янам* і Дж.Ч.*Полані*).

Тв.: Рус. пер. — Молекулярная динамика элементарных химических реакций: Нобелевская лекция. М., 1988. *М.М.Касцюковіч.*

ХЕ́РШЫ (Hershey) Алфрэд Дэй (4.12.1908, г. Авоса, ЗША — 1997), амерыканскі вучоны ў галіне генетыкі і вірусалогіі. Чл. Нац. АН ЗША (1958), чл. Амер. акадэміі мастацтваў і навук. Скончыў Мічыганскі ун-т (1930). Д-р філасофіі

Д.Р.**Хершбах**.

А.Д.**Хершы**.

(1934). З 1934 у Вашынгтонскім ун-це, з 1950 у Ін-це Карнегі (з 1962 дырэктар). Навук. працы па вывучэнні механізмаў перадачы генет. інфармацыі ў фагаў. Даказаў магчымасць рэкамбінацыі ў бактэрыяфагаў і гал. ролю нуклеінавай к-ты ў віруснай інфекцыі. Нобелеўская прэмія 1969 (з М.*Дэльбрукам* і С.*Лурыя*). *В.Ф.Ермакоў.*

ХЕРЭ́С-ДЭ-ЛА-ФРАНТЭ́РА (Jerez de la Frontera), горад на Пд Іспаніі, на р. Гуадалетэ, у аўт. вобл. Андалусія. 183 тыс. ж. (1993). Чыг. вузел. Буйны цэнтр вінаробства (вядомы віном «Херэс») і конегадоўлі. Прам-сць: плодакансервавая, шкляная, тэкст., апрацоўка корку, выtв-сць бочак для віна. Арх. помнікі 13—17 ст., у т.л. арабскі замак Алькасар.

ХЕС (Hess) Вальтэр Рудольф (17.3.1881, г. Фраўэнфельд, Швейцарыя — 12.8.1973), швейцарскі вучоны ў галіне фізіялогіі. Вывучаў медыцыну ва ун-тах Лазаны, Берна, Кіля, Берліна, Цюрыха (1900—05). Д-р медыцыны (1906). Засл. праф. (1951). З 1913 ва ун-тах Цюрыха і Бона, у 1917—51 у Фізіял. ін-це Цюрыхскага ун-та (дырэктар). Навук. працы па праблемах коркавых механізмаў сну, інтэгратыўнай ролі прамежкавага мозга ў вегетатыўных, паводзінскіх і рухальных рэакцыях. Распрацаваў метад ужыўлення электродаў (1924) для даследавання функцый падкоркавых структур мозга. Нобелеўская прэмія 1949 (з А.К.*Монішам*). *В.Ф.Ермакоў.*

ХЕ́СІН Барыс Якаўлевіч (н. 28.7.1945, в. Сафронава Борскага р-на Ніжагародскай вобл., Расія), бел. жывапісец. Скончыў маст.-графічны ф-т Віцебскага пед. ін-та (1967). Працуе ў станковых жывапісе і графіцы, пераважна ў тэхніках тэмперы і акварэлі. Асн. творы: «Слаўны горад Полацк» (1969), «Раніца» (1971), «Стары Віцебск» (1974),

«Дзвіна» (1978), «Цюмень. Палярны Урал» (1986), «Зімовы пейзаж» (1990), «Восень» (1993), «Вечар», «Стары Полацк» (абодва 1994), «Віцебск. У канцы зімы» (1999), нацюрморты. Работы вылучаюцца пластычнай лёгкасцю, складанай рытмікай кампазіцыі, выразнай дынамікай ліній з сакавітымі плямамі колеру. *М.Л.Цыбульскі.*

В.Р.Хес.

К.Л.Хетагураў.

ХЕТАГУ́РАЎ Каста (Канстанцін Леванавіч; 15.10.1859, с. Нар, Паўн. Асеція — 1.4.1906), асецінскі пісьменнік, мастак; заснавальнік асецінскай л-ры і літ. мовы. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1881—85). Пісаў на асецінскай і рус. мовах. Зб-кі «Вершы» (1895, на рус. мове) і «Асецінская ліра» (1899, на асецінскай мове) адыгралі вял. ролю ў развіцці асецінскай л-ры. Сац. праблемы ўзнімаў у псіхал. апавяданнях («Паляванне на тураў», 1893). Гісторыі роднага народа прысвяціў этнагр. нарыс «Асоба» (1894). Аўтар паэм на рус. мове «Фаціма» (1889), «Перад судом», «Каму жывецца весела» (абедзве 1893), п'ес, публіцыст. артыкулаў. Заснавальнік рэаліст. жывапісу Паўн. Асеціі (жанравыя карціны, партрэты, пейзажы Каўказа). На бел. мову яго творы перакладалі Г.Кляўко, Ю.Свірка.

Тв.: Бел. пер. — Асецінская ліра. Мн., 1986; Рус. пер. — Собр. соч. Т.1—3. М., 1974.

Літ.: Тихонов Н. О К.Хетагурове. Орджоникидзе, 1965; Балаев И. Романтическая поэма Хетагурова «Фатима». Орджоникидзе, 1970; Дубовик Н.Г. К.Хетагуров: Библиогр. указ. Орджоникидзе, 1979. *А.С.Пухаеў.*

ХЕТАЛО́ГІЯ, комплекс дысцыплін, якія вывучаюць гісторыю, культуру і мову народаў, што адносяцца да хета-лувійскай моўнай групы індаеўрапейскай сям'і. Пачатак Х. пакладзены асірыёлагамі — англічанінам А.Сейсам, нарвежцам А.Кнудсанам і інш., якія выявілі факт існавання хецкай цывілізацыі (гл. *Хеты, Хецкае царства*). Практычнае яе даследаванне пачалося з раскопак у 1906 ням. археолагам Г.Вінклерам рэшткаў хецкай сталіцы г. Хатусас (гл. *Багазкёй*) і знаходкі ім каля 10 тыс. хецкіх тэкстаў. У 1915—17 чэш. вучоны Б.Грозны прачытаў хецкія клінапісныя тэксты і даказаў, што хецкая мова адносіцца да індаеўрап. моў. Прынцыпы філал. аналізу хецкіх тэкстаў закладзены ў 1920—24 ням. вучонымі Ф.Зомерам і Х.Эелольфам, развіты ў 1920—60-я г. ням. хетолагамі А.Гётцэ і І.Фрыдрыхам. Ням. археолагі на чале з К.Бітэлем у супрацоўніцтве з тур. вучонымі ў 1930-я г. вялі раскопкі ў Багазкёй. Хецкія тэксты вывучалі Х.Г.Гютэрбак (ЗША), Х.Отэн, А.Каменхубер (Германія), Э.Ларош (Францыя), П.Мерыджы (Італія), К.Балкан і Э.Акургал (Турцыя); з сав. вучоных — І.М.Дзьяканаў, Г.Г.Гяргадзе, Э.А.Менабдзе, В.Ардзінба, І.М.Дунаеўская і інш.; на Беларусі — Г.І.Даўгяла.

Літ.: Фридрих И. Дешифровка забытых письменностей и языков: Пер. с нем. М., 1961; Замаровский В. Тайны хеттов: Пер. со словац. М., 1968. *В.У.Адзярыха.*

ХЕ́ТЫ, індаеўрапейскі народ, які ў канцы 3-га тыс. да н.э. — 8 ст. да н.э. насяляў цэнтр. частку М.Азіі. Некат. вучоныя лічаць, што Х. перасяліліся ў М.Азію праз Каўказ ці праз Балканскі п-аў, іншыя — што яны належалі да стараж. насельніцтва М.Азіі. На мяжы 3-га — 2-га тыс. да н.э. знаходзіліся на стадыі распаду родавага ладу. Займаліся жывёлагадоўляй, садаводствам і вінаробствам. Х. адкрылі спосаб плаўкі сталі. У 18 ст. да н.э. засн. *Хецкае царства*. Каля 1595 да н.э. захапілі і разрабавалі *Вавілон*, у пач. 14 ст. падпарадкавалі дзяржаву *Мітані*. Перасяленне на У *«народаў мора»* стала штуршком да падзення дзяржавы Х. Пазней яны растварыліся сярод *фрыгійцаў* і арамеяў. Гісторыю і матэрыяльную культуру Х. вывучае *хеталогія*.

Х. стварылі высокую культуру, якая спалучала традыцыі мясц. малаазійскія, стараж.-егіп. і шумера-вавілонскія (гл. *Вавілона-асірыйская культура*), паўплывала на мастацтва краін-суседзяў (Асірыя, Сірыя, Урарту). У буд-ве яны выкарыстоўвалі грубаапрацаваны камень, масіўныя каменныя блокі, шчыльна злучаныя насуха (цыклапічная муроўка). Іх буйныя паселішчы ўключалі цытадэль (на вяршыні скалы ці ўзгорка), былі абкружаны сценамі. Найб. значны помнік горадабудаўніцтва і архітэктуры — Хатусас (гл. *Багазкёй*). Сярод помнікаў Позняга перыяду — гарады Самаль і Кархемыш з палацавымі будынкамі тыпу «біт-хілані». Для афармлення гар. сцен выкарыстоўвалі высо-

Да арт. **Хеты**. Наверша штандара ў выглядзе аленя з Аладжа-Хююк.

Да арт. **Хеты**. «Ільвіныя» вароты крапасной сцяны Хатусаса. Фрагмент.

Да арт. **Хеты**. Керамічная пасудзіна з Кюль-Тэпе.

кія і плоскія рэльефы (паўфігуры львоў і сфінксаў на варотах крапасных сцен у Хатусасе), для абліцоўкі палацаў — артастаты — выявы божастваў, жывёл, сцэны з прыдворнага жыцця. На скалах высякалі сцэны працэсій божастваў. Рэльефы 2-га тыс. да н.э. падначалены ўмоўнаму канону: галава і ногі — у профіль, плечы і вока — у фас. Вядома і круглая скульптура (статуі божастваў) з рысамі асірыйскага і арамейскага мастацтва. Высокага ўзроўню дасягнула маст. апрацоўка металу (штандары-эмблемы, статуэткі божастваў), т.зв. кападакійская кераміка (паліхромныя і размаляваныя пасудзіны, манахромная, чорна- і чырвонаглянцаваная, збаны, чашы, пасудзіны з арнаментам, выявамі галоў жывёл), былі пашыраны чырвонаглянцаваныя пасудзіны, выкананыя на ганчарным крузе. У перыяд Новага Хецкага царства пераважала размаляваная паліхромная кераміка, пакрытая палівай, вял. парадныя пасудзіны з рэльефнымі выявамі. Характэрны таксама пячаткі ў форме круглага штэмпеля з сім. кампазіцыямі з іерагліфічных і сімвалічных выяў.

Літ.: Гарни О.Р. Хетты: Разрушители Вавилона: Пер. с англ. М., 2002.

ХЕФРЭ́Н (грэч. Chephrēn), Хафра (егіп.), егіпецкі фараон IV дынастыі канца 27 — пач. 26 ст. да н.э. Сын ці брат *Хеопса*. Паводле *Герадота*, Х. працягваў дэспатычную палітыку Хеопса. Піраміда Х. ў Гізе — другая па велічыні (вышыня 143,5 м), злучана крытым ходам з гранітным храмам у даліне, у якім знойдзены 2 дыярытавыя статуі Х. У час яго праўлення каля піраміды высечаны са скалы Вялікі сфінкс (іл. гл. да арт. *Піраміда*).

ХЕ́ЦКАЕ ЦА́РСТВА, старажытная дзяржава ў М.Азіі ў 18 — пач. 12 ст. да н.э. Засн. *хетамі*. Утварылася з малаазійскіх паліт. аб'яднанняў 20—19 ст. да н.э. (Канес, Хатусас, Бурушханда). Пры хецкім цару Анітасе (каля 18 ст. да н.э.), які заваяваў г. Неса і Хатусас, пачалося аб'яднанне абласцей *Анатолії*. У часы Стараж. царства (1750—1450 да н.э.) хеты стварылі дзяржаву на тэр. Цэнтр. Турцыі з сталіцай у г. Кусар. Канчаткова Х.ц. склалася пры Лабарне I [1680—1650 да н.э.], калі ўладанні хетаў дасягнулі Чорнага м. Сталіца была перанесена ў г. Хатусас (гл. *Багазкёй*). Пры Мурсілі I [1620—1590 да н.э.] ваен. магутнасць Х.ц. дасягнула найвыш. ўздыму. У 1595 да н.э. захоплены і разрабаваны *Вавілон*. Пасля смерці Мурсілі I на працягу 100 гадоў у Х.ц. вялася міжусобная барацьба. У 16 ст. да н.э. складзены хецкія законы. У 14 — пач. 12 ст. да н.э. (т.зв. перыяд Новага царства) на чале дзяржавы стаялі *хурыты*. Цар Супілуліума I [1380—1340 да н.э.] падпарадкаваў дзяржаву *Мітані* і зрабіў сваім васалам *Угарыт*. З канца 14 ст. да н.э. Х.ц. і Егіпет змагаліся за гегемонію ў Пярэдняй Азіі. Паводле дагавора 1280 да н.э. яны падзялілі паміж сабой Сірыю і *Фінікію*. У канцы 14 — пач. 12 ст. да н.э. супраць Х.ц. выступіла кааліцыя дзяржаў (Ахіява, Арцава і інш.). Перасяленне на У М.Азіі *«народаў мора»* прывяло да распаду Х.ц. У канцы 12 ст. да н.э. цар Асірыі Тыглатпаласар I падпарадкаваў яго тэрыторыі. Асобныя хецкія княствы існавалі да канца 8 ст. да н.э. і канчаткова паглынуты Асірыяй.

Літ.: Довгяло Г.И. К истории возникновения государства: На материале хеттских клинописных текстов. Мн., 1968; Гарни О.Р. Хетты: Разрушители Вавилона: Пер. с англ. М., 2002.

«ХЁХСТ» (Hoechst), нямецкая хімічная кампанія, якая выпускае хім. валокны, пластмасы, лекі і інш. Засн. ў 1863. Штаб-кватэра ў г. Франкфурт-на-Майне, ФРГ. Да 1952 уваходзіла ў германскі хім. канцэрн «І.Г.Фарбеніндустры». Аб'ём продажу прадукцыі 23,3 млрд. дол., чысты прыбытак 1 млрд. долараў (1989). У вытв-сці занята каля 165 тыс. чал.

ХІБІНІ́Т (ад назвы горнага масіву *Хібіны*), магматычная шчолачная горная парода, буйназярністая разнавіднасць *нефелінавага сіеніту*, якая мае ўключэнні *эўдыяліту*. Складаецца са шчолачнага палявога шпату, нефеліну, эгірыну, арфведсаніту і інш. Складае буйныя масівы ў вобласці развіцця шчолачных парод (напр., у Хібінскіх тундрах на Кольскім п-ве). Выкарыстоўваецца як буд. матэрыял.

ХІБІ́НСКІЯ РАДО́ВШЧЫ апатыта-нефелінавыя. У Мурманскай вобл. Расіі, на Кольскім п-ве ў межах горнага масіву Хібіны; унікальная па запасах і якасці база фасфатнай сыравіны. Распрацоўваюцца з 1930. Пл. больш за 1300 км^2. Агульныя запасы 4 млрд. т руды, якая мае ў сабе 7,5—19% P_2O_5, 13—16% Al_2O_3. Здабыча вядзецца адкрытым і падземным спосабамі. Цэнтр — г. Кіраўск.

ХІБІ́НЫ (ад хібін, на мове саамаў — горы), інтрузіўны горны масіў на Кольскім п-ве, у Расіі. Выш. да 1191 м (г. Часначор). Складзены пераважна з нефелінавых сіенітаў, з якімі звязаны радовішчы апатыта-нефелінавых руд (Кукісвумчор, Юкспор, Расвумчор і інш.). Вяршыні платопадобныя, на схілах ледавікі і снежнікі; актыўная лавінная дзейнасць. Горныя тундры, каля падножжа — хваёвыя лясы, бярозавае крывалессе. На г. Вуд'еўрчор Палярнаальпійскі бат. сад.

ХІ́БНАСЦЬ у матэматыцы, лік, які характарызуе меру блізкасці дакладнага і набліжанага значэнняў пэўнай *велічыні*. Адрозніваюць абсалютную Х. — модуль рознасці $|x - a|$ і адносную Х. — $|x - a|/a$ (звычайна выражаецца ў працэнтах), дзе a — дакладнае і x — набліжанае значэнні зададзенай велічыні.

Пры лікавым рашэнні задач Х. вынікаў абумоўлена набліжаным матэм. апісаннем рэальнага працэсу, недакладнасцю задання зыходных даных, недакладнасцю метаду рашэння і Х. акруглення. Звычайна значэнне a невядомае і таму для характарыстыкі дакладнасці набліжанай роўнасці $x \approx a$ абмяжоўваюцца ўказаннем верхняй мяжы абс. Х. (лімітнай абс. Х.), якая вызначаецца як лік Δa такі, што $|x - a| \le \Delta a$. Аналагічна вызначаецца лімітная адносная Х. Выраз «лік x роўны a з дакладнасцю Δa» матэматычна запісваецца як $x=a \pm \Delta a$. Гл. таксама *Памылак тэорыя*.

ХІБНАСЦЬ ВЫМЯРЭ́ННЯ, характарыстыка выніку *вымярэння*, якая паказвае адхіленне знойдзенага значэння велічыні ад яе сапраўднага значэння.

Адрозніваюць абсалютную Х.в. (выражаецца ў адзінках велічыні, якая вымяраецца) і адносную, роўную адносінам абсалютнай Х.в. да сапраўднага значэння велічыні (выражаецца ў долях адзінкі, працэнтах і г.д.). Сістэматычныя Х.в. абумоўлены пераважна *хібнасцямі сродкаў вымярэнняў*, выпадковыя — некантралюемымі зменамі ўмоў вымярэнняў, промахі (грубыя хібнасці, якія істотна адрозніваюцца ад чаканых) — няспраўнасцю сродкаў вымярэнняў. Выпадковыя Х.в. звычайна ацэньваюць метадамі матэм. статыстыкі (гл. *Памылак тэорыя*).

ХІБНАСЦЬ СРО́ДКАЎ ВЫМЯРЭ́ННЯЎ, несупадзенне значэння фіз. велічыні, знойдзенага з дапамогай сродку вымярэнняў, з сапраўдным яе значэннем.

Бываюць Х.с.в. абсалютныя (рознасць паміж паказаннямі сродкаў вымярэнняў і сапраўдным значэннем велічыні) і адносныя (адносіны абсалютных хібнасцей да адпаведных сапраўдных значэнняў). Для кожнага тыпу сродкаў вымярэнняў устаноўлены межы дапушчальных хібнасцей. Ёсць сістэматычныя Х.с.в., якія не мяняюцца або мяняюцца заканамерна (напр., з-за няправільна нанесеных метак на шкале прылады) і выпадковыя (напр., што ўзнікаюць ад трэння рухомых частак прылады). Хібнасць *мер* — вынік несупадзення намінальнага значэння меры з сапраўдным значэннем узнаўляльнай ёю фіз. велічыні.

ХІВА́, горад ва Узбекістане, у Харэзмскім вілаеце. Размешчаны ў Харэзмскім аазісе, на канале Палван. Каля 50 тыс. ж. (1999). Прам-сць: лёгкая (бавоўнаачышчальная, дывановая, швейная), вытв-сць керамікі і сувеніраў. Х. — горад-музей архітэктуры Харэзма (пераважна 19 — пач. 20 ст.): цытадэль Куня-арк, рабад Дышан-кала, запаведнік Ічан-кала (палац Таш-Хаўлі) і інш.

Паводле археал. звестак, засн. на рубяжы нашай эры. Назву атрымала ад стараж. кало-

Да арт. **Хіва**. Медрэсэ Мухамед Амін-хана. 1851—52.

дзежа Хейвак (да 18 ст. горад наз. Хівак), дзе ў старажытнасці праходзіў гандл. шлях, што звязваў Усход і Захад. З пач. 4 ст. н.э. разам з *Харэзмам* у складзе перс. дзяржавы. Горад быў абнесены крапасной сцяной. У 712 завяванa арабамі, у 1221 — манголамі, у 1388 — Цімурам. З 16 ст. да 1920 — сталіца *Хівінскага ханства*. У 1740 Х. зруйнавана *Надзір-шахам*. У 1873 узята рас. войскамі і разам з усім Хівінскім ханствам стала пратэктаратам Рас. імперыі. З 1920 сталіца *Харэзмскай народнай савецкай рэспублікі*. З 1924 райцэнтр у складзе Узб. ССР [з 1938 у Харэзмскай вобл. (вілаяце)].

ХІВІ́НСКАЕ ХА́НСТВА, дзяржава ў Сярэдняй Азіі ў 16 — пач. 20 ст. на тэр. стараж. *Харэзма*, паўн. ч. Харасана і Туркменіі. Сталіцы — Вазір, *Ургенч*, *Хіва*. Узнікла ў 1512 пад уладай узб. хана Ільбарса. У 16 — 1-й пал. 18 ст. ў Х.х. ішла вострая міжусобная барацьба (улада была сканцэнтравана ў руках гал. саветнікаў ханаў — інакаў), адначасова вяліся войны з качэўнікамі-туркменамі і іншаземнымі заваёўнікамі. У 1740 ханства падпарадкаваў правіцель Ірана *Надзір-шах*. У 1763 да ўлады прыйшоў інак Мухамед Амін, пры якім адбылася ўнутрыпаліт. і эканам. стабілізацыя ханства. Яго ўнук Ільтузар [1804—06] у пач. 19 ст. абвясціў сябе ханам і заснаваў дынастыю Кунграт (правіла да канца існавання Х.х.). Найб. магутнасці Х.х. дасягнула пры хане Мухамедзе Рахіме [1806—25], які завяршыў яго аб'яднанне, правёў падатковую рэформу, падпарадкаваў суседнія ўладанні (аральскае, каракалпакаў і інш.). У 1840—60-я г. аднавіліся войны з *Бухарскім эміратам* і туркменамі, што прывяло да заняпаду дзяржавы. У 1873 Хіву занялі рус. войскі і Х.х. прызнала пратэктарат Расіі пры захаванні ўнутр. аўтаноміі. У пач. 20 ст. ў ханстве вырасла роля туркм. плямён на чале з Джунаід-ханам, які двойчы захопліваў у Х.х. ўладу (1916 і 1918), што зноў выклікала міжусобіцы. У пач. 1920 Чырв. Армія ўвайшла на тэр. Х.х. і прымусіла хана 2.2.1920 перадаць уладу рэўкому *Харэзмскай народнай савецкай рэспублікі*.

В.У.Адзярыха.

ХІ́ГЕР (Heeger) Алан Джэй (н. 22.1.1936, г. Сіу-Сіці, ЗША), амерыканскі фізік. Чл. Нац. АН ЗША (2001), Нац. інж. акадэміі ЗША (2002). Бацька нарадзіўся ў Віцебску. Скончыў ун-т штата Небраска ў г. Омаха (1957) і Каліфарнійскі ун-т у г. Берклі (1961). З 1962 у Пенсільванскім ун-це (з 1967 праф.), з 1982 у Каліфарнійскім ун-це ў г. Санта-Барбара. Адначасова з 1990 у карпарацыі «Юнякс» (прэзідэнт, з 1994 навук. кіраўнік і старшыня савета дырэктараў). Навук. працы па фізіцы цвёрдага цела, фізіцы металаў, фізіцы і хіміі палімераў. Разам з А.*Мак-Дыярмідам* (гл. Дадатак) і Х.*Шыракавай* адкрыў новы тып матэрыялаў — электраправодныя палімеры з высокай удзельнай праводнасцю (1977), што прывяло да стварэння і практычнага выкарыстання палімераў з эл. і аптычнымі ўласцівасцямі паўправаднікоў і металаў. Нобелеўская прэмія 2000 (з Мак-Дыярмідам і Шыракавай). *М.М.Касцюковіч.*

ХІГРЫ́Н Барыс Львовіч (14.8.1909, г. Орша Віцебскай вобл. — 5.7.1941), Герой Сав. Саюза (1941). Скончыў Маскоўскае артыл. вучылішча (1933). У Чырв. Арміі з 1931. Удзельнік паходу Чырв. Арміі ў Зах. Украіну ў 1939. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Зах. фронце. Артыл. дывізіён на чале з капітанам Х. вызначыўся 5.7.1941 каля г.п. Бялынічы Магілёўскай вобл. ў баі з танк. групай праціўніка: прычыніў ёй значныя страты ў

А.Дж.Хігер. Б.Л.Хігрын. А.В.Хіл.

жывой сіле і баявой тэхніцы; асабіста Х. падбіў 4 танкі ворага. Загінуў у гэтым баі. На месцы гібелі Х. пастаўлена гармата з мемар. дошкай.

ХІДА́, хрыбет у цэнтральнай частцы в-ва Хонсю, у Японіі. Даўж. каля 140 км. Выш. да 3190 м (г. Ярыгатаке). Складзены з кварцытаў, сланцаў, вапнякоў, гранітаў і вулканічных парод. Грэбень альпійскага тыпу з карамі і цыркамі. Вулканы Онтаке, Нарыкура і інш. На схілах у ніжняй ч. — шыракалістыя і мяшаныя лясы, вышэй — хвойныя. Нац. парк Цюбу-Сангаку. Радовішчы свінцова-цынкавых руд.

ХІ́ДЖРА (араб. перасяленне), пераезд Мухамеда з Меккі ў Медыну ў 622. У гонар гэтай падзеі год Х. абвешчаны пачаткам мусульм. летазлічэння, якое таксама наз. Х. У адпаведнасці з мусульм. месяцавым календаром у ліст. 1980 завяршыўся 1400 год Х. і пачалося 15 ст. Дата шырока адзначалася ў мусульм. свеце і была выкарыстана рэліг. арг-цыямі для ўзмацнення прапаганды ісламу.

ХІДРАЎСКАЕ МАЛАДЗЁЖНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала з 1941 да вер. 1942 у в. Хідра Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. Аб'ядноўвала 17 чал. (кіраўнікі А.П.Гутараў, І.В.Новікаў, А.А.Талбатаў, С.М.Юшко), складалася з груп у в. Балачанка, Дукаўка, Забалева, Падкамень, Падсобнае, Ясная Паляна і інш. Падпольшчыкі збіралі і перадавалі партызанам зброю, вялі агітацыю сярод насельніцтва, распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, праводзілі дыверсіі на лесапільні, лесаскладзе, кардоннай ф-цы, псавалі лініі тэлеф. сувязі, узрывалі масты на шашэйных дарогах і інш. У вер. 1942 падпольшчыкі пайшлі ў партызаны. За час дзеяння падполля загінула 9 падпольшчыкаў.

ХІ́ДРЫ, вёска ў Кобрынскім р-не Брэсцкай вобл., каля аўтадарогі Кобрын — Дзівін. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 10 км на Пд ад горада і 13 км ад чыг. ст. Кобрын, 56 км ад Брэста. 802 ж., 260 двароў (2002). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, фізкультурна-аздараўленчы комплекс, амбулаторыя, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

ХІЁНАСФЕ́РА (ад грэч. chiōn снег + *сфера*), частка трапасферы, у межах якой на паверхні сушы пры спрыяльных умовах рэльефу магчыма зараджэнне і існаванне *снежнікаў* і *ледавікоў*. Х. акружае Зямлю суцэльнай абалонкай магутнасцю да 10 км, мае дадатны баланс цвёрдых атм. ападкаў. Верхняя мяжа Х. звычайна размешчана вышэй ўзроўню самых высокіх гор, ніжняя — на *снегавой лініі*. Языкі многіх горных ледавікоў спускаюцца за яе межы, асобныя невял. ледавікі ва ўмовах павышанай канцэнтрацыі снегу часам цалкам размешчаны ніжэй Х.

ХІЛ (Hill) Арчыбалд Вівіен (26.9.1886, г. Брысталь, Вялікабрытанія — 3.6.1977), англійскі вучоны ў галіне фізіялогіі. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1918). Скончыў Кембрыджскі ун-т (1907). З 1911 у Кембрыджскім, з 1920 Манчэстэрскім ун-тах. З 1923 ва універсітэцкім каледжы (Лондан). Навук. працы па тэрмадынаміцы мышачнай дзейнасці і механізме мышачнага скарачэння. Нобелеўская прэмія 1922 (з О.Ф.*Меергофам*). *В.Ф.Ермакоў.*

ХІ́ЛА (Gila), рака на ПдЗ ЗША, левы прыток р. Каларада. Даўж. 1040 км, пл. бас. 150 тыс. км^2. Вытокі на плато Каларада. У верхнім і сярэднім цячэнні даліна каньёнападобная, рэчышча з пастаянным цячэннем, у ніжнім (у пустыні Хіла) — звычайна перасыхае. Сярэдні расход вады 15 м^3/с. У сярэднім цячэнні плаціны Кулідж і Гілеспі.

ХІЛАМІКРО́НЫ (ад грэч. chylos сок, млечны сок + mikros малы), часцінкі нейтральнага *тлушчу*. Складаюцца з *халестэрыну*, трыгліцэрыдаў, бялкоў. Вял. іх колькасць у лімфе, асабліва пасля прыёму тлустай ежы. Ажыццяўляюць транспарт тлушчаў па крывяносных сасудах.

ХІ́ЛАРЫ (Hillary) Эдмунд Персіваль (н. 20.7.1919, г. Окленд, Новая Зеландыя), альпініст, палярнік, грамадскі дзеяч. У 1953 разам з Н.*Тэнцынгам* выканаў першаўзыходжанне на *Джамалунгму*. У 1955—58 кіраваў групай новазел. даследчыкаў у складзе Трансантарктычнай экспедыцыі краін Брытанскай садружнасці, дасягнуў Паўд. полюса (1958). У 1960—61 узначальваў экспедыцыю ў Гімалаях па вывучэнні працэсаў акліматызацыі ва ўмовах доўгатэрміновага знаходжання на вял. вышынях; у 1967 зрабіў першаўзыходжанне на г. Гершэль (Антарктыда, выш. 3335 м); у 1977 у часе экспедыцыі па р. Ганг упершыню падняўся да яе вытокаў. Займаецца арганізацыяй буд-ва школ, бальніц, аэрадромаў для шэрпаў, у т.л. на ўласныя сродкі. *А.М.Петрыкаў.*

ХІЛЕСТРО́М (Hillerström) Пер (18.11.1732, Веддзё, Швецыя — 13.8.1816), шведскі жывапісец; заснавальнік нац. школы быт. жанру. Вучыўся ў Стакгольме. У 1757—58 наведваў майстэрню Ф.Бушэ ў Парыжы. З 1810 дырэктар Стакгольмскай АМ. Зазнаў уплыў Ж.Б.*Греза* і Ж.Б.*Шардэна*. Прадстаўнік асветніцкай лініі ў шведскім мастацтве 18 ст. У сваіх невял. карцінах са сцэнамі вясковага і гарадскога жыцця сялян і наёмных рабочых часта выкарыстоўваў рэзкія святлоценявыя кантрасты, якія надаюць прадметную важкасць і матэрыяльнасць прыроднаму і быт. асяроддзю («Кузня», 1781). Яго работы вылучаюцца строгасцю і прастатой кампазіцыі, манахромнасцю багатага тонкімі адценнямі калярыту. Пісаў таксама партрэты і нацюрморты.

ХІЛІ́ЦКІ Яцак, бел. мастак 17 ст. Родам з Гродзеншчыны. У 1681—83 выканаў 3 насценныя кампазіцыі на гіст. тэмы для *Замосценскага касцёла*. У 1689 размаляваў плафоны на міфалагічныя сюжэты ў палацы в. Замосце Слуцкага р-на Мінскай вобл.

ХІЛІ́ЯЗМ (ад грэч. chilias тысяча), м і л е н а р ы з м (ад лац. mille тысяча), рэлігійна-філасофскае вучэнне, паводле якога канчатковаму канцу свету будзе папярэднічаць тысячагадовы перыяд Царства Божага (другое прышэсце *Хрыста*), калі ўсталююцца ўсеагульны мір і гармонія паміж чалавекам і прыродай. Узнік ва ўлонні хрысціянства на мяжы 1—2 ст., відаць, пад уплывам іудзейскага вучэння пра *месію*. Гал. біблейская крыніца Х. — літаральнае тлумачэнне 20—22-й глаў Адкрыцця св. Іаана Багаслова (*Апакаліпсіса*), а таксама сцвярджэнні ў інш. кнігах Новага Запавету (Евангелле ад Лукі, 1-е Пасланне да карынфіян апостала Паўла і інш.). Заснавальнікам Х. лічыцца ератык апостальскіх часоў Керынф (некат. прыпісвалі яму аўтарства Апакаліпсіса).

Хіліястычных ідэй прытрымліваліся многія стараж.-хрысц. тэолагі і пісьменнікі (Папій Іерапольскі, Юсцін-філосаф, Юлій Афрыканскі, К.С.Ф.Тэртуліян і інш.). Супраць Х. выступалі Дыянісій Вялікі, Еўсевій Кесарыйскі, Васілій Вялікі, Грыгорый Назіянзін, Аўгусцін Блажэнны і інш. У 2 ст. Х. быў найб. пашыраны ў малаазійскіх цэрквах, у 3 ст. — у Егіпце. У 4 ст., калі хрысціянства стала дзярж. рэлігіяй у Рым. імперыі, хрысц. царква пачала праследаваць хіліястаў як ератыкоў. У сярэдневякоўе, у час росквіту разнастайных містычных вучэнняў, Х. аднавіўся і стаў часткай многіх ератычных вучэнняў; яго прапаведавалі Іаахім Флорскі, радыкальныя рэфарматары (*альбігойцы*, Т.Мюнцэр, гусіты, *анабаптысты*). Х. пашырыўся ў 19—20 ст.: яго прытрымліваюцца *адвентысты, мармоны, сведкі Іеговы*. Каталіцкі касцёл з Эфескага сабора (431) лічыць Х. тэалаг. памылкай (у 1944 ён афіцыйна асуджаны каталіцкімі касцельнымі ўладамі). Правасл. багаслоўе пакідае гэтае пытанне адкрытым. Адмоўна ставяцца да Х. і асн. пратэстанцкія цэрквы. *Н.К.Мазоўка.*

ХІЛЬДЭБРАНД, Г і л ь д э б р а н д (Hildebrand) Адольф фон (6.10.1847, г. Марбург, Германія — 18.1.1921), нямецкі

А. фон **Хільдэбранд**. Фантан «Вітэльсбах». 1894.

скульптар і тэарэтык мастацтва. Вучыўся ў Маст. школе ў Нюрнбергу (1864—66) і ў Мюнхене (1866—67). З 1867 перыядычна жыў у Італіі і Германіі. У мастацтве падзяляў погляды неаідэалізму, што абумовіла рысы яго творчасці: унутр. замкнёнасць і своеасаблівая халоднасць вобразаў, статычнасць формы і пластычная яснасць, лаканізм і архітэктанічная дакладнасць кампазіцыі: «Адам» (1878), фантан «Вітэльсбах» (1894), партрэты А.Бёкліна (1897) і В. фон Бодэ (1900). Вывучаў асн. заканамернасці ўзаемадзеяння формы і прасторавых уяўленняў у мастацтве. Яго тэарэт. канцэпцыі развіты ў ням. мастацтвазнаўстве канца 19 — пач. 20 ст.

ХІЛЬДЭБРАНТ, Г і л ь д э б р а н т (Hildebrandt) Іаган Лукас фон (14.11.1668, г. Генуя, Італія — 16.11.1745), аўстрыйскі архітэктар; адзін з вядучых прадстаўнікоў аўстр. барока. Вучыўся ў Рыме ў К.Фантаны. Служыў інжынерам у арміі прынца Яўгена Савойскага (з 1701 прыдворны інжынер). У манум. пабудовах Х. багатыя рытмічныя чляненні працягглых фасадаў і пышная арнаментыка спалучаліся са строгай сіметрычнасцю планіроўкі: палацы Даўн-Кінскі (1713—16), Бельведэр Ніжні (1714—16) і Верхні (1721—22; усе ў Вене).

ХІЛЬКЕ́ВІЧ Анатоль Паўлавіч (н. 11.6.1934, в. Бярозаўка Слуцкага р-на Мінскай вобл.), бел. філосаф. Д-р філас. н. (1994), праф. (1991). Засл. дз. нав. Беларусі (1996). Скончыў БДУ (1957). З 1965 у Нац. ін-це бяспекі (у 1976—78 нач. кафедры, у 1978—91 нам. нач. ін-та). З 2000 у Мінскім ін-це кіравання. Навук. працы па тэорыі і метадалогіі пазнання, праблемах логікі, псіхалогіі, методыкі вывучэння і фарміравання асобы.

Тв.: Гносеологическая природа гипотезы. Мн., 1974; Проблема расширения традиционной силлогистики. Мн., 1981; Психологический портрет личности. Мн., 2002 (разам з Г.М.Явелькіным). *М.П.Савік.*

ХІЛЬКО́ Юрый Іванавіч (н. 13.2.1960, г. Баранавічы Брэсцкай вобл.), бел. графік. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1991). З 1993 выкладае ў Бел. АМ. Творы вылучаюцца стрыманасцю, псіхал. глыбінёй, лірызмам, рытмічным і пластычным адзінствам, цэласнасцю і гарманічнасцю кампазіцыйнага вырашэння: «Дошкі» (1987), «Званіца», «Вясёлка» (абодва 1988), «Горад памяці»,



Ю.**Хілько**. У пачатку вёскі. 2001.

«Фэст» (абодва 1989), «Два воблакі», «Адзінота» (абодва 1990), «Шляхам знічкі» (1991), «Крыжы на Радзіме Адама» (1992), «Карані» (1993), «Малітва» (1994), «Насуперак плыні» (1997), «Памяці былых сядзіб» (1998), «Успаміны пра Эдэм» (1999), «У пачатку вёскі» (2001), «Назіральнік» (2003). Выканаў ілюстрацыі да кніг «Вянок» М.Багдановіча» (1994), «Журавінавы востраў» Г.Пашкова (1998), «Як агонь, як вада» А.Лойкі (2000), зб. «Агледзіны» (1998).

Л.Ф.Салавей.

ХІМАЗІ́Н, тое, што *сычужны фермент*.

ХІМАПСІ́Н, ферментны прэпарат, які змяшчае А-*хіматрыпсін* і *трыпсін*.

Парашок белага колеру, часам з жаўтаватым адценнем, добра растварацца ў вадзе, у фізіял. растворы. Атрымліваюць з падстраўнікавай залозы забітай жывёлы. Растварае згусткі крыві, паскарае рэгенерацыю пашкоджаных тканак і інш. Выкарыстоўваюць для лячэння гнойных ран, трафічных язваў, апёкаў, кератытаў і інш.

І.М.Семяненя.

ХІМАТРЫПСІ́Н, фермент класа *гідралаз*, які змяшчаецца ў сакрэце падстраўнікавай залозы жывёл і чалавека. Разам з *трыпсінам* і інш. пептыдазамі ўдзельнічае ў расшчапленні бялкоў у тонкім кішэчніку. Сінтэзуецца клеткамі падстраўнікавай залозы ў форме неактыўнага папярэдніка хіматрыпсінагену і пад уздзеяннем трыпсіну ператвараецца ў актыўны Х. Стварожвае малако. Ферменты тыпу Х. выяўлены ў ніжэйшых пазваночных і насякомых.

ХІМА́ЧАЛ-ПРА́ДЭШ, штат на Пн Індыі. Пл. 55,6 тыс. км^2. Нас. 5,2 млн. чал. (1991); хіндустанцы, пахары і інш. Адм. ц. — г. *Сімла*. З ПнЗ на ПдУ штат перасякаюць горныя хрыбты Зах. Гімалаяў; з ПдЗ на ПнУ зменьваюцца Сівалікскія горы, хр. Дхааладхар, Вял. Гімалаі і хр. Заскар. У гарах клімат горны субтрапічны і высакагорны. Вярхоўі рэк Сатледж, Біяс, Раві, Чынаб. Хвойныя і шыракалістыя лясы. Пераважае сельская гаспадарка. У далінах рэк вырошчваюць пшаніцу, кукурузу, ячмень, рыс, бульбу; пладаводства (яблыкі, персікі, абрыкосы, арэхі, гранаты); нарыхтоўка лекавых раслін. Здабыча каменнай солі. Лесанарыхтоўкі; дрэваапр. і цэментная прам-сць. Рамесніцкая вытв-сць шарсцяной пражы, хустак і тканін. Горны курорт Сімла.

«ХІМВАЛАКНО́», вытворчыя аб'яднанні па выпуску сінт. валакна, якія падпарадкоўваюцца канцэрну «Белнафтахім». Гл. *Гродзенскае вытворчае аб'яднанне «Хімвалакно», Магілёўскае вытворчае аб'яднанне «Хімвалакно»* і *Светлагорскае вытворчае аб'яднанне «Хімвалакно»*.

ХІМЕ́ДЗІ, горад у Японіі, на З в-ва Хонсю. 461 тыс. ж. (1992). Трансп. вузел. Порт на Унутраным Японскім моры. Прам-сць: металургічная (буйны камбінат), маш.-буд., тэкст., нафтаперапр., хім., дрэваапр., харчовая. Стараж. замак Хімедзі-дзё (14—17 ст.) уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.

ХІМЕ́НЕС (Jiménez) Хуан Рамон (24.12.1881, г. Магер, Іспанія — 29.5.1958), іспанскі паэт; прадстаўнік *мадэрнізму*. Належаў да пісьменнікаў «Пакалення 1898 года». Для зб. «Журботныя арыі»

Х.Р.Хіменес.

(1903) і інш. характэрны суб'ектывізм і меланхолія. У зб. «Вясеннія балады» (1910) традыцыі андалускага фальклору. У зб-ках «Духоўныя санеты», «Дзённік паэта-маладажона» (абодва 1917), «Бясконцасць» (1918) зварот да ўнутр. свету чалавека. Адыход ад класіцыстычных форм, імкненне да непасрэднасці адлюстравання ў вершах і лірычнай прозе (кнігі «Платэра і я», 1914; «Звер з глыбіні душы», 1949) і крытычных эсэ («Іспанцы трох светаў», 1942; «Бясконцы паток», апубл. 1961). Нобелеўская прэмія 1956.

Тв.: Рус. пер. — Избранное. М., 1981.

ХІМЕ́РА, 1) у стараж.-грэч. міфалогіі пачвара з галавой ільва, тулавам казы і хвастом дракона. 2) У выяўл. мастацтве

Хімера з г. Арэца (Італія). Каля 480 да н.э.

скульпт. выява фантаст. пачвары, што ўвасабляе заганы, сілы зла. Уваходзілі ў скульпт. ўбранне гатычных сабораў. 3) У пераносным сэнсе — фантазія, неажыццявімая мара.

ХІМЕ́РА (ад *Хімера*) у біялогіі, арганізм-мазаік, які спалучае ў сабе клеткі, тканкі або ч. цела розных арганізмаў. Аснова — аб'яднанне клетак, якія паходзяць ад розных *зігот*. Першасныя Х. — аб'яднанне генетычна розных клетак у адзін зародак на ранніх стадыях *эмбрыягенезу* (або з моманту апладнення); яны не маюць адзнак імуналагічнай несумяшчальнасці. Другасныя Х. — камбінацыя тканак 2 і болей зародкаў або дарослых асобін пасля пачатку *арганагенезу* шляхам трансплантацыі органаў, пералівання крыві, спантаннага пераносу крыві паміж пладамі або ад маці да плода.

Натуральныя Х. ўзнікаюць у выніку агрэгацыі 2 зігот, дысперснага апладнення, мутацый, рэкамбінацый, парушэння клетачнага дзялення; штучныя — атрымліваюць шляхам тканкавай трансплантацыі або метадам прышчэпак (у раслін). Напр., распрацаваны метад аб'яднання бластамераў грызуноў, якія адрозніваюцца афарбоўкай шэрсці. Атрыманыя Х. маюць па-рознаму афарбаваныя ўчасткі цела. Выкарыстоўваюць для аналізу праблем антагенезу і імуналогіі. Гл. таксама *Мазаіцызм*.

А.С.Леанцюк.

ХІМЕ́РЫ, хімерападобныя (Chimaeriformes), атрад храстковых рыб падкл. злітначарапных, або суцэльнагаловых. Вядомы з юрскага перыяду, пашыраны ў мелавы перыяд. 13 сям. Х. вымерла; 3 сучасныя: хімеравыя (Cnimaeridae), насатыя, або рынахімеравыя (Rhinochimaeridae), і хобатнарылыя, або каларынхавыя (Callorhinchidae). 6 родаў, каля 30 відаў. Пашыраны ў Атлантычным, Індыйскім і Ціхім акіянах. Пераважна глыбакаводныя (да 2500 м) прыдонныя рыбы. Маларухомыя.

Цела голае, сціснутае з бакоў, даўж. да 1,5 м, маса да 10 кг, хвост ніткападобны. Спіна чырв.-бурая, бакі серабрыстыя з жаўтаватабурымі плямамі. На галаве ў самцоў калючы булавападобны прыдатак, брушныя плаўнікі ператвораны ў *капулятыўныя органы* (птэрыгаподыі). Размнажаюцца яйцамі, якія змешчаны ў рогападобнай капсуле. Рыла падобнае на тупы конус. Зубы — тоўстыя пласці-

Хімеры: 1 — каларынх; 2 — еўрапейская; 3 — насатая.

ны. Кормяцца ігласкурымі, малюскамі, ракападобнымі, радзей рыбаю. Некат. — аб'екты промыслу.

ХІМЕРЫ́ЗМ, аб'яднанне генетычна розных клетак (або групы клетак) у адзін зародак (арганізм). Гл. *Хімера*.

ХІМІЗА́ЦЫЯ, кірунак навукова-тэхн. прагрэсу ў нар. гаспадарцы, які характарызуецца ўкараненнем хім. матэрыялаў і метадаў апрацоўкі ў вытв-сць і побыт. Дае магчымасць павышаць эфектыўнасць вытв-сці, удасканальваць тэхналогію, паляпшаць якасць прадукцыі, эканоміць прыродную сыравіну і інш. Матэрыяльная база Х. — *хімічная прамысловасць*. Найб. інтэнсіўна ідзе ў прам-сці і буд-ве (выкарыстанне пластмас і сінт. смол, хім. ваклонаў, лакаў, фарбаў і інш.) сельскай і лясной гаспадарцы (гл. *Хімізацыя сельскай гаспадаркі*). Парушэнні правіл транспарціроўкі, захоўвання і выкарыстання хім. сродкаў вядуць да *хімічнага забруджвання* навакольнага асяроддзя.

ХІМІЗА́ЦЫЯ СЕ́ЛЬСКАЙ ГАСПАДА́РКІ, укараненне хім. матэрыялаў і хім. метадаў апрацоўкі ў с.-г. вытв-сць. Асн. кірункі Х.с.г.: выкарыстанне ўгнаенняў, хім. сродкаў аховы раслін і жывёл ад шкоднікаў, хвароб і пустазелля; хім. прадуктаў у жывёлагадоўлі, кансерваванні с.-г. прадуктаў і расл. кармоў; сінт. матэрыялаў у меліярацыі і с.-г. буд-ве, *хімічная меліярацыя* глеб і інш. Гл. таксама *Хімізацыя*.

Літ.: Кузина К.И., Фокина В.Д., Покровская С.Ф. Химизация, окружающая среда и качество продукции. М., 1982.

ХІ́МІКА-ТЭРМІ́ЧНАЯ АПРАЦО́ЎКА металаў, адначасовае хім. і цеплавое ўздзеянне на вырабы гал. чынам з металаў і сплаваў. Прыводзіць да змены хім. саставу і структуры ў паверхневых слаях, зрэдку ва ўсім аб'ёме вырабу. Асн. від Х.-т.а. — *азатаванне, аксідаванне, алітаванне, барыраванне, храмірaванне, цынкаванне, цыянаванне, цэментацыя* і інш. Найб. пашыраны цэментацыя і азатаванне.

Пры Х.-т.а. выраб награваюць у хімічна актыўным асяроддзі некалькі гадзін пры т-ры, роўнай 0,5—0,8 т-ры плаўлення асн. кампаненту. У час вытрымкі паверхня вырабу абагачаецца хім. элементамі за кошт дыфузіі на глыбіню ад некалькіх мікраметраў да некалькіх міліметраў. Павышае даўгавечнасць дэталей машын і вырабаў (павялічвае іх цвёрдасць, зносаўстойлівасць, каразійную стойкасць і інш.).

ХІ́МІЧ Фёдар Васілевіч (н. 22.4.1917, с. Новадзімітрыеўка Іванаўскага р-на Херсонскай вобл., Украіна), удзельнік вызвалення Беларусі ў Вял. Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Качынскую ваен. школу пілотаў (1939), Ваен.-паветр. акадэмію (1951). У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 на Ленінградскім, Сталінградскім, Цэнтр. і 1-м Бел. франтах: камандзір звяна, эскадрыллі, пам. камандзіра знішчальнай авіядывізіі па паветр.-стралк. службе. Да жн. 1944 зрабіў 535 баявых вылетаў, асабіста збіў 13 і ў пары 4 самалёты праціўніка. Вызначыўся ў баях пад Ленінградам, Сталінградам, Арлом, Гомелем, Бабруйскам, Люблінам, Варшавай, Берлінам. Пасля вайны да 1962 на камандных пасадах у ВПС.

ХІМІ́ЧНА ЎСТО́ЙЛІВЫЯ МАТЭРЫЯ́ЛЫ, матэрыялы, якія характарызуюцца высокай устойлівасцю да дзеяння хімічна актыўных асяроддзяў (кіслот, шчолачаў, акісляльнікаў і інш.). Іх устойлівасць вызначаецца саставам, структурай, порыстасцю і інш. Падзяляюцца на метал. і неметал. (неарган., арган. і кампазіцыйныя).

Да метал. Х.ў.м. належаць сплавы на аснове жалеза (сталі і чыгуны), легіраваныя хромам, нікелем, марганцам і інш., некат. каляровыя металы (медзь, алюміній, тытан, цырконій) і іх сплавы. Найб. Х.ў.м. з'яўляюцца *высакародныя металы*. Сярод неарган. Х.ў.м. адрозніваюць прыродныя (базальт, граніты, даламіт, мармур, вапняк, кварцыты) і штучныя (сіталы тэхн., борасілікатнае і кварцавае шкло, эмалі, кераміка). Да Х.ў.м. арган. паходжання належаць прыродныя матэрыялы (драўніна, бітумы, асфальт) і сінтэтычныя (пластмасы, гума, графітапласты і інш.). Кампазіцыйныя Х.ў.м. маюць напаўняльнікі з неарган. рэчываў і сувязныя з арган. Х.ў.м.; вызначаюцца высокімі мех. трываласцю, цеплаўстойлівасцю, нізкай цеплаправоднасцю.

ХІМІ́ЧНАЕ ЗАБРУ́ДЖВАННЕ, забруджванне навакольнага асяроддзя, якое суправаджаецца зменай яго прыродных уласцівасцей, найперш перавышэннем натуральных канцэнтрацый у ім прыродных ці пранікненнем у асяроддзе не ўласцівых яму хім. рэчываў і злучэнняў.

На Беларусі асн. агенты Х.з. (штогадовы выкід) атм. паветра: аксід вугляроду (каля 700 тыс. т), дыаксід серы (140 тыс. т), аксіды азоту (135 тыс. т), лятучыя арган. рэчывы (240 тыс. т), цвёрдыя рэчывы (65 тыс. т), таксама фармальдэгід, фенол, аміяк, цяжкія металы і інш.; паверхневых вод: хларыды (78 тыс. т), сульфаты (64 тыс. т), завіслыя рэчывы (15 тыс. т) і арган. (11 тыс. т) рэчывы, нафтапрадукты (230 т), медзь (18 т), інш. металы (491 т) і інш.; глеб: пестыцыды (да 1,5 ГДК), цяжкія металы (да 0,8 ГДК), сульфаты (да 0,9 ГДК), нітраты (да 1 ГДК). Вядомыя выпадкі Х.з. паверхневых вод да 30 ГДК нафтапрадуктамі, аманійным і нітрытным азотам, цынкам, меддзю, малібдэнам. Асн. забруджвальнікі паветра — аўтатранспарт і інш. рухомыя ўстаноўкі (72,7%), аб'екты энергетыкі (5%), прамысл. прадпрыемствы (асабліва нафтахім., металургічныя, мінер. угнаенняў). Асн. аб'ём забруджаных сцёкавых вод утвараецца ў жыллёва-камунальнай гаспадарцы (46%), прам-сці (31%), сельскай гаспадарцы (9,5%). *П.І.Лабанок.*

ХІМІ́ЧНАЕ І НАФТАХІМІ́ЧНАЕ МАШЫНАБУДАВА́ННЕ, галіна агульнага машынабудавання, прадпрыемствы якога вырабляюць разнастайнае тэхнал. абсталяванне, а таксама камплекты тэхнал. ліній і ўстановак для хім. і нафтахім., нафтавай і газавай прам-сці. Як самаст. галіна машынабудавання ўзнікла ў канцы 19 ст. На Беларусі пачала стварацца пасля 2-й сусв. вайны. У рэспубліцы няма буйных спецыялізаваных прадпрыемстваў гэтай галіны, але больш як на 20 з-дах наладжаны выпуск разнастайнай яе прадукцыі. Так, *Мінскі электратэхнічны завод* імя В.І.Казлова вырабляе нафтапрамысл. абсталяванне, Гродзенскі мех. з-д — хім. абсталяванне і запасныя часткі да яго, «Мінскстроммаш» — абсталяванне для хім. прам-сці, з-д «Сейсматэхніка» ў Гомелі — абсталяванне для абследавання і рамонту свідравін, Магілёўскі рамонтна-мех. з-д — запчасткі для хім. абсталявання, «Тэрма-Брэст» (сумеснае бел.-венгерска-аўстрыйскае прадпрыемства) — фільтры газавыя і клапаны электрамагнітныя газавыя, *Навагрудскі завод газавай апаратуры* — лічыльнікі расходу газу, «Колерніт» (прадпрыемства ў г. Дзяржынск) — краны газавыя, рэгулятары ціску газу і інш. З замежных краін машынабудаванне гэтай прам-сці найб. развіта ў ЗША, Японіі, Германіі, Вялікабрытаніі, Францыі, Італіі, Расіі.

П.І.Рогач.

ХІМІ́ЧНАЙ БУДО́ВЫ ТЭО́РЫЯ, класічная структурная тэорыя аб залежнасці ўласцівасцей рэчываў (пераважна арган.) ад будовы іх малекул. Асн. прынцыпы Х.б.т. прапанаваны А.М.*Бутлеравым* (1861), які ўпершыню ўвёў паняцце аб хім. будове (або структуры) рэчыва як вызначанай паслядоўнасці, паводле якой атамы злучаюцца ў адпаведнасці з іх *валентнасцю* і ўтвараюць малекулы рэчыва.

Асн. палажэнне Х.б.т. — хім. і фіз. ўласцівасці злучэнняў залежаць не толькі ад тыпу і колькасці атамаў, якія ўваходзяць у іх састаў, але і ад хім. будовы малекул. Кожнаму рэчыву адпавядае пэўная формула хім. будовы, якую можна паказаць графічна. Такая структурная формула дае ўяўленне аб магчымых хім. ператварэннях рэчыва. Бутлераў растлумачыў адрозненні ўласцівасцей ізамерных злучэнняў (гл. *Ізамерыя*) як рэчываў аднолькавага якаснага і колькаснага саставу, але розных па хім. будове, а таксама адкрыў з'яву *таўтамерыі*. Х.б.т. дала магчымасць прадказання, сінтэзу і доказу будовы разнастайных ізамерных злучэнняў рада вуглевадародаў, спіртоў, карбонавых кіслот. Яна садзейнічала развіццю арган. сінтэзу, дазволіла сістэматызаваць шматлікія эксперым. даныя, стала фундаментам для класіфікацыі арган. злучэнняў і іх наменклатуры. Х.б.т. далей развіта ў працах У.В.*Маркоўнікава*, А.М.*Зайцава* і інш. Асн. палажэнні Х.б.т. на сучасным этапе хім. навукі паглыблены электроннымі ўяўленнямі аб хім. сувязі, яе квантава-хім. апісаннем, пацверджаны данымі фізіка-хім. метадаў даследавання структуры рэчываў. Гл. таксама *Арганічная хімія, Стэрэахімія*.

Літ.: Бутлеров А.М. Соч. Т.1—3. М., 1953—58; Столетие теории химического строения. М., 1961; Быков Г.В. История органической химии. М., 1976. *У.І.Тыворскі.*

ХІМІ́ЧНАЙ РАЗВЕ́ДКІ ПРЫЛА́ДЫ, прылады для выяўлення баявых атрутных, моцнадзейных ядавітых і тэхн. рэчываў у паветры. Да іх адносяць аўтам. газасігналізатары, комплексныя (вайсковыя) прылады хім. разведкі, у аснове дзеяння якіх хім., іонаметрычныя, фіз.-хім. метады індыкацыі. *І.Г.Лазараў.*

ХІМІ́ЧНАЯ ЗБРО́Я, від *зброі масавага знішчэння*, дзеянне якой заснавана на выкарыстанні баявых *атрутных рэчываў*, *таксінаў*, *фітатаксінаў*. Уключае хім. *боепрыпасы* аднаразовага выкарыстання (артыл. снарады, авіяц. бомбы, міны, шашкі і інш.) і шматразовага (т. зв. хім. баявыя прылады — выліўныя авіяц. прылады, тэрмамех. і мех. генератары і інш.).

Сродкі дастаўкі Х.з.: авіяцыя, ракеты, артылерыя і інш. Паражальная дзейнасць Х.з. заснавана на таксічных уласцівасцях хім. злучэнняў, якія знаходзяцца ў парападобным, вадкім або аэразольным стане, могуць пранікаць у арганізм цераз органы дыхання, скурнае покрыва, слізістыя абалонкі, страўнікавы тракт. Х.з. можа быць выкарыстана для паражэння жывой сілы, заражэння мясцовасці, узбраення, баявой тэхнікі і розных тылавых аб'ектаў. Ад інш. відаў зброі адрозніваецца: высокай таксічнасцю, што дазваляе малымі дозамі выклікаць значныя страты ў стане працаўніка; вял. пранікальнасцю ў розныя збудаванні, ваен. тэхніку і інш.; складанасцю своечасовага выяўлення наяўнасці выкарыстання атрутных рэчываў, распазнавання іх тыпу, вызначэння тэрміну дзеяння і інш. Упершыню Х.з (*хлор*) была выкарыстана ў 1-ю сусв. вайну герм. войскамі 22.4.1915 у раёне г. Іпр (Бельгія), пазней арміямі інш. дзяржаў.

Выкарыстанне Х.з. забаронена Жэнеўскім пратаколам 1925. У 1993 у Парыжы прынята канцэпцыя аб забароне распрацоўкі, вытв-сці, назапашвання і выкарыстання Х.з. і яе знішчэнні (уведзена ў дзеянне ў крас. 1997).

Літ.: У Тан. Химическое и бактериологическое (биологическое) оружие и последствия его возможного применения: [Доклад на XXIV сессии Генеральной Ассамблеи ООН]. М., 1970; Степанов А.А., Попов В.Н. Химическое оружие и основы противохимической защиты. М., 1962; Керш С. Химическое и биологическое оружие: Пер. с англ. М., 1970. *І.А.Шор.*

ХІМІ́ЧНАЯ МЕЛІЯРА́ЦЫЯ, паляпшэнне хім. і фіз. стану глебы ўнясеннем хім. рэчываў з мэтай стварэння спрыяльных умоў для інтэнсіўнага развіцця с.-г. культур; адзін з відаў с.-г. меліярацыі.

Характар Х.м. вызначаюць колькасцю макра- і мікраўтрыманняў у глебе, яе кіслотнасцю, шчолачнасцю ці засоленасцю, узроўнем біял. актыўнасці, патрэбнасцю раслін у мінер. солях. Рознымі відамі Х.м. рэгулююць колькасць у глебе солей (унясенне мінер. угнаенняў, *гіпсаванне глебы*) і кіслот (*вапнаванне глебы*), паляпшаюць структуру глебы, праводзяць сан.-дэзінфекцыйную апрацоўку палёў пестыцыдамі.

ХІМІ́ЧНАЯ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, галіна цяжкай індустрыі, на прадпрыемствах якой выкарыстоўваюць хім. метады перапрацоўкі сыравіны і матэрыялаў, атрымліваюць розную хім. прадукцыю (арган. і неарган. хімікаты, мінер. ўгнаенні і сыравіну для іх, фарбавальнікі, хім. валокны і інш.). Да Х.п. адносяцца: *бытавой хіміі прамысловасць, лакафарбавая прамысловасць, сінтэтычных смол і пластычных мас прамысловасць, сінтэтычных фарбавальнікаў прамысловасць, хімічных валокнаў прамысловасць* і інш.

Прадпрыемствы Х.п. з'явіліся ў 1-й пал. 18 ст. ў Вялікабрытаніі, Францыі і былі звязаны пераважна з вытв-сцю кіслот і соды. У 1-й пал. 19 ст. ў Вялікабрытаніі пачалі вырабляць штучныя ўгнаенні. У пач. 20 ст. наладжана вытв-сць пластмас і штучных валокнаў. Інтэнсіўнае развіццё Х.п. пачалося пасля 2-й сусв. вайны. Найб. развіта ў ЗША, Японіі, Германіі, Вялікабрытаніі, Расіі і інш.

На Беларусі ў пач. 20 ст. дзейнічалі невял. прадпрыемствы лесахіміі, па вырабе пакосту, метылавага спірту, каніфолі, шкіпінару і фарбаў. Асн. прадпрыемствы створаны ў 1960-я г. У 2000 працавала 70 прадпрыемстваў Х.п., найбуйнейшыя з іх: «*Беларускалій*», *Брэсцкі завод бытавой хіміі, Гомельскі хімічны завод, Гродзенскае вытворчае аб'яднанне «Азот»*, *Лідскі лакафарбавы завод, Магілёўскае вытворчае аб'яднанне «Хімвалакно»*, *Наваполацкае вытворчае аб'яднанне «Палімір»*, *Светлагорскае вытворчае аб'яднанне «Хімвалакно»*, сумеснае бел.-герм. прадпрыемства «Оліа-Бела» і інш. Прадпрыемствы Х.п. ёсць у Пінску, Мазыры, Бабруйску, Барысаве, Кобрыне і інш. У 1995 выраблена мінер. угнаенняў 3345 тыс. т, сернай к-ты 437 тыс. т., сінт. мыйных сродкаў 4,8 тыс. т, у 2001 адпаведна 4379 тыс. т, 534 тыс. т, 8,3 тыс. т. *П.І.Рогач.*

ХІМІ́ЧНАЯ СУ́ВЯЗЬ, узаемадзеянне паміж атамамі (іонамі), якое вядзе да ўтварэння хім. злучэння (малекулы, крышталя) і вызначае яго энергію, малекулярную структуру, рэакцыяздольнасць і інш. Узнікае ў выніку электрастатычнага ўзаемадзеяння паміж электронамі і ядрамі атамаў малекул. Колькасць Х.с., якія атам можа ўтварыць, вызначаецца будовай яго знешняй электроннай абалонкі (гл. *Валентнасць*). Тэарэт. аснову Х.с. вывучае *квантавая хімія*. Прыроду і ўласцівасці Х.с. вызначаюць *рэнтгенаструктурным аналізам, спектральным аналізам*.

Паводле характару размеркавання электроннай шчыльнасці паміж атамамі адрозніваюць *іонную сувязь* (электроны пераходзяць ад аднаго атама да другога; іоны, што ўтварыліся, утрымліваюцца побач сіламі электрастатычнага ўзаемадзеяння) і *кавалентную сувязь* (злучэнне і аграмаджанне пары электронаў, па аднаму ад розных атамаў). Найб. пашыраны прамежкавыя выпадкі Х.с. — палярныя кавалентныя сувязі з рознай ступенню іоннасці. *Каардынацыйная сувязь* — кавалентная палярная сувязь, якая ўтвараецца за кошт двух электронаў аднаго атама. *Металічная сувязь*, характэрная для металаў, утвараецца паміж катыёнамі металу (узнікаюць у выніку страты электронаў) і «электронным газам», які запаўняе прастору паміж іонамі і забяспечвае эл. праводнасць металаў. *Вадародныя сувязі* ўтвараюцца паміж малекуламі рэчываў, здольных утвараць «вадародныя мосцікі» (вада, спірты, пептыды). У шырокім сэнсе да Х.с. таксама адносяць сілы міжмалекулярнага ўзаемадзеяння (гл. *Ван-дэр-Ваальса сілы*).

Літ.: Полинг Л. Общая химия: Пер. с англ. М., 1974; Краснов К.С. Молекулы и химическая связь. 2 изд. М., 1984; Эткинс П. Физическая химия: Пер. с англ. Т. 1—2. М., 1980. *А.М.Рабцаў.*

ХІМІ́ЧНАЯ ТЭХНАЛО́ГІЯ, сукупнасць метадаў і сродкаў рацыянальнай хім. перапрацоўкі прыроднай сыравіны, паўфабрыкатаў і прамысл. адходаў; навук. дысцыпліна, якая распрацоўвае і ўдасканальвае гэтыя спосабы і сродкі. Адрозніваюць Х.т. агульную і галіновыя (буд. матэрыялаў і сілікатаў, хім. прам-сці, металургічнай, тэкст., гарбарнай, харч. і інш.). Агульная Х.т. вывучае праблемы аптымізацыі фіз.-хім. умоў рэакцый, тэхнал. схем, вытв. працэсаў; абгрунтоўвае патрабаванні да сыравіны, энергетыкі; распрацоўвае прынцыпы кантрольна-вымяральнай тэхнікі, прафес. гігіены, тэхнікі бяспекі, аховы прыроды.

Х.т. грунтуецца на працэсах: мех. (*здрабненне, грануляцыя*, транспарціроўка цвёрдых матэрыялаў), гідрамех. (перамяшчэнне вадкасцей і газаў па трубаправодах і апаратах, *пнеўматычны транспарт, флатацыя, цэнтрыфугаванне* і інш.), цеплавых (*выпарванне, кандэнсацыя, плаўленне, крышталізацыя* і інш.), дыфузных ці масаабменных (*абсорбцыя, адсорбцыя, дыстыляцыя, рэктыфікацыя, сублімацыя, экстракцыя* і інш.), хім. (*акісленне-аднаўленне*, гідрыраванне, галагенраванне, *полімерызацыя*, цыклізацыя і інш.). Сучасныя Х.т. характарызуюцца стварэннем агрэгатаў вял. магутнасці; асваеннем працэсаў, у якіх выкарыстоўваюцца звышвысокія і звышнізкія т-ры і ціск; высокаэфектыўных каталізатараў; атрыманнем рэчываў з незвычайнымі каштоўнымі ўласцівасцямі (звышчыстых, звышцвёрдых, звышмоцных, энергаўстойлівых, хімічна ўстойлівых і інш.).

На Беларусі даследаванні па Х.т. вядуцца ў ін-тах Нац. АН, БДУ, Бел. тэхнал. ун-це.

Літ.: Кутепов А.М., Бондарева Т.И., Беренгартен М.Г. Общая химическая технология. 2 изд. М., 1990; Дытнерский Ю.И. Процессы и аппараты химической технологии. Ч. 1—2. М., 1992; Технология основного органического синтеза: Совмещенные процессы. М., 1993. *М.Р.Пракапчук.*

ХІМІ́ЧНАЯ ФІ́ЗІКА, раздзел навукі на мяжы *хіміі* і *фізікі*. Спалучае *фізічную хімію, плазмахімію, фотахімію, хімію цвёрдага цела, электрахімію*. Тэрмін увёў ням. хімік А.Эйкен (1930). У самаст. раздзел вылучылася ў пач. 20 ст. са з'яўленнем *квантавай механікі, квантавай хіміі, кінетыкі хімічнай*. Найб. эфектыўна Х.ф. фарміравалася як вынік развіцця тых раздзелаў хіміі, у якіх прагрэс дасягаўся з выкарыстаннем сучаснай тэхнікі фіз. эксперымента і дасягненняў тэарэт. фізікі. Уклад у развіццё Х.ф. зрабіў М.М.*Сямёнаў*, які ў 1920—30-я г. адначасова з С.Н.*Хіншэлвудам* стварыў тэорыю *ланцуговых хімічных рэакцый*.

Х.ф. вывучае квантава-мех. паходжанне хім. узаемадзеянняў і рэакцыйнай здольнасці злучэнняў, будову і ўласцівасці малекул, *кластэраў*, крышталёў і вадкасцей, даследуе прыроду элементарных актаў хім. працэсаў, свабодна-радыкальных рэакцый, фотахім. і радыяцыйна-хім. працэсаў. Новы кірунак Х.ф. — даследаванне хім. паводзін рэчываў у экстрэмальных умовах (напр., пры т-рах, блізкіх да абсалютнага нуля, звышмоцных магнітных і эл. палях). Вывучае таксама працэсы, якія выклікаюцца ўдарнымі хвалямі ў газах і вадкасцях; дзеяннем магутнага лазернага выпрамянення і інш. Метады даследавання: аптычная і люмінесцэнтная *спектраскапія*,

мас-спектраметрыя, рэнтгеналструктурны аналіз, электронаграфія і інш. Асобная ўвага аддаецца імпульсным метадам вывучэння хуткіх працэсаў (напр., імпульсны фаталіз).

На Беларусі даследаванні па Х.ф. вядуцца ў ін-тах фізіка-арган. хіміі, агульнай і неарган. хіміі, фізікі Нац. АН, БДУ, Бел. тэхнал. ун-це.

Літ.: Семенов Н.Н. Химическая физика. Черноголовка, 1975; Бутягин П.Ю. Химическая физика твердого состояния вещества. [Ч. 1—2]. М., 1989—91; Химическая физика на пороге XXI в. М., 1996.

А.І.Кулак.

ХІМІ́ЧНЫ ПАТЭНЦЫЯ́Л, тэрмадынамічная функцыя стану, якая вызначае змену тэрмадынамічных патэнцыялаў пры змене колькасці часціц у сістэме. Вызначаецца як прырашчэнне адвольнага *патэнцыялу тэрмадынамічнага* пры павелічэнні на 1 моль колькасці рэчыва пэўнай кампаненты сістэмы пры пастаянных астатніх параметрах стану. Уведзены Дж.У.*Гібсам* (1875) пры разглядзе хім. раўнавагі ў шматкампанентных сістэмах (адсюль назва).

Дазваляе сфармуляваць умовы *раўнавагі тэрмадынамічнай*, адна з якіх — Х.п. дадзенай кампаненты аднолькавы ў розных *фазах* і ў розных месцах адной фазы. Адсюль вынікае, што ў *гетэрагенных сістэмах* магчымы самаадвольны пераход толькі з фазы з большым Х.п. у фазу з меншым Х.п. Калі ўмовы раўнавагі Х.п. парушаюцца, у сістэме ўзнікае асматычны ціск. Як нарміровачная пастаянная Х.п. уваходзіць у размеркаванні Больцмана, Бозе—Эйнштэйна, Гібса, Фермі—Дзірака і інш. Для выраджанага газу электронаў (*фермі-газу*) Х.п. тоесна супадае з *фермі энергіяй* (у паўправадніках — з *фермі ўзроўнем*). Х.п. выкарыстоўваецца для апісання ўласцівасцей сістэм з пераменным лікам часціц, напр., дзе адбываюцца хім. рэакцыі, фазавыя пераходы, іанізацыя, растварэнне. *П.С.Габец.*

ХІМІ́ЧНЫ РАКЕ́ТНЫ РУХАВІ́К, тып *ракетнага рухавіка*, які працуе на хім. *ракетным паліве*. Паводле агрэгатнага стану паліва падзяляюцца на *вадкасныя ракетныя рухавікі, цвердапаліўныя ракетныя рухавікі і гібрыдныя ракетныя рухавікі*. Развіваюць рэактыўную цягу ад доляў ньютана да дзесяткаў меганьютанаў. Выкарыстоўваюцца на снарадах ракетнай артылерыі і на касм. ракетах (гл. *Ракета-носьбіт*).

ХІМІ́ЧНЫХ ВАЛО́КНАЎ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, галіна *хімічнай прамысловасці* па вырабе сінт. і штучных валокнаў. Базавая сыравіна для вытв-сці сінт. валокнаў (капронавых, лаўсанавых, нітронных) — прадукты перагонкі нафты, каменнага вугалю і прыроднага газу; штучных (віскозных, ацэтатных) — прыродная цэлюлоза, атрыманая з драўніны або бавоўны. Да хім. адносяць і валокны, атрыманыя з неарган. злучэнняў, напр., шкловалакно і інш. Хім. валокны — зыходная сыравіна для *тэкстыльнай прамысловасці* і шыннай прам-сці; выпускаюцца ў выглядзе неперарыўнай ніткі на бабінах і шпулях (даўж. да 100 тыс. м) і кароткіх валокнаў, што змешваюцца з бавоўнай (воўнай) і ідуць на выраб пражы. Прадпрыемства па вытв-сці штучных валокнаў з'явілася ў 1891 у Францыі, сінт. — у 1932 у Германіі. Найб. развіта ў ЗША, Японіі, Вялікабрытаніі, Францыі, Італіі, Расіі.

На Беларусі станаўленне Х.в.п. пачалося ў 1930-я г., калі пабудаваны *Магілёўскі завод штучнага валакна* (у 1940 вырабляў 40% хім. валокнаў у СССР). У 1965—68 пабудаваны *Магілёўскі камбінат сінтэтычнага валакна*. На іх базе працуе *Магілёўскае вытворчае аб'яднанне «Хімвалакно»* (поліэфірныя валокны і ніткі, віскозныя тэкст. ніткі, лаўсан і інш.). У 1960-я г. ўведзена ў строй *Светлагорскае вытворчае аб'яднанне «Хімвалакно»* (віскозная кордавая тканіна, нятканыя матэрыялы, поліпрапілен і інш.). У 1978 заснавана *Гродзенскае вытворчае аб'яднанне «Хімвалакно»*, якое выпускае капронавыя валокны. На *Наваполацкім вытворчым аб'яднанні «Палімір»* наладжаны выпуск акрылавага валакна. На *Полацкім заводзе шкловалакна* вырабляюць шкловалакно, шкланітку, шклотканіну. У 1995 выраблена 210,6 тыс. т хім. валокнаў і ніцяў, у т.л. 9,8 тыс. т штучных валокнаў і ніцяў; 200,8 тыс. т сінт. валокнаў. У 2000 — 218,7 тыс. т, у т.л. 11,7 тыс. т штучных валокнаў і ніцяў; 207 тыс. т сінт. валокнаў. Значная колькасць хім. валокнаў экспартуецца ў Расію, Германію, Нідэрланды, Чэхію і інш. *П.І.Рогач.*

ХІМІ́ЧНЫЯ ВО́ЙСКІ. Ва Узбр. Сілах СССР (да пач. 1990-х г.) — спец. войскі, прызначаныя для забеспячэння дзеянняў войск (сіл) ва ўмовах радыеактыўнага, хім. і біял. заражэння. Ва Узбр. Сілах Рэспублікі Беларусь наз. войскі радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны. У арміях інш. краін часці і падраздзяленні, якія выконваюць аналагічныя задачы, наз. войскамі абароны ад *зброі масавага знішчэння* і інш.

З'явіліся ў час 1-й сусв. вайны ў 1915, калі ўпершыню былі выкарыстаны *атрутныя рэчывы* і *агнямёты*. Да 1918 Х.в. меліся ў складзе армій амаль усіх краін, што ўдзельнічалі ў вайне. У Чырв. Арміі Х.в. створаны ў 1918. Да пач. 1925 ва ўсіх стралк. і кав. палках, а ў 1927 у дывізіях і брыгадах сфарміраваны хім. падраздзяленні. У 1930-я г. створаны асобныя батальёны процівхім. абароны і дэгазацыйныя батальёны. На ўзбраенне Х.в. паступілі міны, агнямёты, рэактыўныя ўстаноўкі, агнямётныя танкі, спец. хім. машыны і інш. У Вял. Айч. вайну ў складзе Х.в. існавалі тэхн. брыгады (задымлення і маскіроўкі важных аб'ектаў), брыгады (з канца 1943), асобныя батальёны і роты процівхім. абароны, асобныя агнямётныя батальёны, роты і інш. Яны вялі разведку, знішчалі жывую сілу і тэхніку праціўніка агнямётна-запальнымі сродкамі, маскіравалі дымамі свае войскі і аб'екты тылу.

Шэраг падраздзяленняў і часцей Х.в. БВА удзельнічалі ў мінімалізацыі і ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Х.в. Узбр. Сіл Рэспублікі Беларусь складаюцца з падраздзяленняў і часцей, якія пры неабходнасці павінны выконваць задачы па радыяцыйнай хім. разведцы, дэзактывацыі, дэгазацыі дэзінфекцыі ўзбраення, абмундзіравання і інш. матэрыяльных сродкаў, а таксама дэзінфекцыі, дэгазацыі і дэзінсекцыі мясцовасці. У Х.в. ўваходзяць таксама падраздзяленні агнямётна-запальных сродкаў і маскіровачных дымоў.

І.А.Шор

ХІМІ́ЧНЫЯ КРЫНІ́ЦЫ ТО́КУ, разнавіднасць *крыніц току*, у якіх электрычная энергія атрымліваецца за кошт праможа пераўтварэння хім. энергіі ў рэакцыях *акіслення-аднаўлення*. Да Х.к.т. адносяць *гальванічныя элементы* (у т.л. *нармальныя элементы*), *электрычныя акумулятары* і *паліўныя элементы*.



Схема **хімічнай крыніцы току**: 1 — электроды; 2 — электраліт; 3 — рэзервуар; $R_н$ — супраціўленне электрычнай нагрузкі; e^- — электроны.

Прынцып дзеяння Х.к.т. заснаваны на пераходзе электронаў пры пэўных хім. рэакцыях ад аднаго рэчыва да другога. Акісляльнік і аднаўляльнік у іх адасоблены, а электроны перамяшчаюцца з дапамогай электраправоднага матэрыялу, у якім узнікае эл. ток. Пры выкарыстанні Х.к.т. назапашаныя ў іх рэчывы расходуюцца, што і абмяжоўвае час іх работы. Х.к.т. створаны ў 19 ст. (Вольтаў слуп у 1800, элемент Даніела—Якобі ў 1836, *Лекланшэ элемент* у 1865 і інш.). Да 1860-х г. Х.к.т. былі адзінай крыніцай сілкавання эл. прылад.

Літ.: Багоцкий В.С., Скундин А.М. Химические источники тока. М., 1981.

ХІ́МІЯ [ад позналац. chimia; слова «Х.» выводзяць або ад назвы Стараж. Егіпта «Хем» (цёмны, чорны ад колеру глебы ў даліне р. Ніл; «егіпецкая навука»), або ад стараж.-грэч. chēmeía — мастацтва выплаўкі металаў], навука аб саставе, структуры, уласцівасцях рэчываў і іх ператварэннях, якія суправаджаюцца зменамі саставу і структуры; адна з галін *прыродазнаўства*. Вывучае і апісвае ператварэнні рэчываў як у макра- (на ўзроўні макраколькасцей), так і ў мікрамаштабе (на атамна-малекулярным узроўні). Упершыню тэрмін «Х.» выкарыстаў у 5 ст. грэч. алхімік Засіма.

Падзяляецца на *арганічную хімію* і *неарганічную хімію*. На стыку гэтых навук развіваюцца Х. *комплексных злучэнняў* і Х. *элементаарганічных злучэнняў*. Тлумачэннем сутнасці хім. з'яў і ўстанаўленнем іх агульных заканамернасцей займаецца *фізічная хімія*, шэраг раздзелаў якой, звязаных з вывучэннем асаблівасцей працякання хім. працэсаў пад уплы-

вам розных фактараў, вылучыліся ў асобныя навукі, напр., *механахімія, радыяцыйная хімія, фотахімія* і інш. Метады ідэнтыфікацыі рэчываў, што спалуюначаць хім. падыходы з фіз. метадамі, вывучае *аналітычная хімія*. Развіццё спец. метадаў у 20 ст. садзейнічала станаўленню і развіццю нанахіміі, аб'екты даследавання якой — часцінкі памерам некалькі *нанаметраў*. Тэарэт. асновы сучасных вытв-сцей вывучае *хімічная тэхналогія*. На стыку Х. з інш. прыродазнаўчымі навукамі інтэнсіўна развіваюцца *агрохімія, біяхімія, геахімія, квантавая хімія, хімічная фізіка* і інш.

Станаўленне Х. пачалося ў стараж. часы. Напачатку чалавек выкарыстоўваў хім. змены біял. аб'ектаў (браджэнне, гніенне), з асваеннем агню і гарэння — хім. працэсы спякання і сплаўлення (вытв-сць ганчарных вырабаў, шкла), выплаўку металаў. Вытв-сць жалеза, медзі, серабра, свінцу існавала ў Месапатаміі за 3 тыс. г. да н.э. У эпоху антычнасці (5 ст. да н.э. — 5 ст. н.э.) з'явіліся ўяўленні аб рэчывах як камбінацыях 4 касм. стыхій (*Эмпедокл, Арыстоцель*), аб існаванні атамаў (*Леўкіп, Дэмакрыт*). У 1 ст. н.э. пачала развівацца *алхімія*, якая спалучала элементы філас. і практычных ведаў. Фарміраванне Х. як навукі адносіцца да 16—18 ст., калі хім. даследаванні ўсё больш накіроўваліся на патрэбы практыкі, развівалiся металургія і шкларобства, вытв-сць керамікі і фарбаў. Р.*Бойль* у працы «Хімік-скептык» (1661) развіў уяўленне аб хім. атамах. Вял. значэнне ў развіцці Х. мелі адкрыццё закону захавання масы рэчываў пры хім. рэакцыях (М.В.*Ламаносаў*, 1748; А.Л.*Лавазье*, 1774), высвятленне таго, што гарэнне і акісленне — працэсы злучэння рэчываў з часцінкамі паветра (Ламаносаў, 1756), адкрыццё кісларoду (Лавазье, 1774), Крыху пазней адкрыты законы пастаянства саставу (Ж.Л.*Пруст*, 1799), кратных адносін (Дж.*Дальтан*, 1804), аб'ёмных адносін (Ж.Л.*Гей-Люсак*, 1805), *Авагадра закон* (1811). Класічная Х. (сярэдзіна 19 — пач. 20 ст.) грунтавалася на атамна-малекулярным вучэнні. Ф.А.*Кекуле* распрацаваў у 1857 тэорыю валентнасці ў дастасаванні да арган. злучэнняў, выявіў чатырохвалентнасць вугляроду і магчымасць утварэння вугляродных ланцугоў. З'явілася тэорыя хім. будовы (А.М.*Бутлераў*, 1861), Дз.І.*Мендзялееў* адкрыў перыядычны закон (1869) і склаў *перыядычную сістэму элементаў Мендзялеева*.

Сучасная Х. вырашае агульныя фундаментальныя праблемы: *сінтэз хімічны*, кіраванне хім. працэсамі, хім. энергетыка; паглыбленая і комплексная хім. перапрацоўка мінер. сыравіны, нафты, газу і цвёрдых гаручых выкапняў; хім. аналітыка і дыягностыка і інш. Сучасны этап развіцця Х. звязаны з выкарыстаннем квантавых уяўленняў аб рэчыве і яго пераўтварэннях. Назіраецца тэндэнцыя пераходу да размежавання хім. навук не па функцыях, а па аб'ектах вывучэння. Дасягненні Х. пашыраны ў металургіі, вытв-сці пластмас, сінт. валокнаў, мінер. угнаенняў, паўправадніковых матэрыялаў, лек. прэпаратаў, у быт. хіміі і інш.

На Беларусі Х. як навука пачала вывучацца ў 2-й пал. 18 ст. ў навук. установах Гродна і Вільні. Навук. даследаванні ў галіне Х. праводзяцца ў ін-тах Нац. АН, БДУ, Бел. дзярж. тэхнал. ун-це, інш. ВНУ, у лабараторыях прамысл. аб'яднанняў і фірм. Сувязі паміж навук. хім. цэнтрамі розных краін ажыццяўляе Міжнар. саюз тэарэт. і прыкладной Х. Асн. кірункі развіцця Х. на Беларусі: *аналітычная хімія, арганічная хімія, біяарганічная хімія, калоідная хімія, лесахімія, нафтахімія, хімія высокамалекулярных злучэнняў, хімія торфу, хімія цвёрдага цела* і інш. Найб. значны ўклад у развіццё і арганізацыю навук. даследаванняў па Х. зрабілі Ю.А.*Альдэкоп*, Ф.Г.*Асіпенка* (гл. Дадатак), А.А.*Ахрэм*, М.А.*Безбародаў*, А.С.*Вечар*, Б.В.*Ерафееў*, Г.Я.*Каба*, М.С.*Казлоў*, У.С.*Камароў*, Ф.М.*Капуцкі*, К.М.*Караткоў*, М.П.*Круцько*, Ф.А.*Лахвіч*, А.І.*Леснікоўіч*, І.І.*Ліштван*, М.А.*Майер*, М.І.*Міцкевіч*, М.М.*Паўлючэнка*, Я.А.*Продан*, М.А.*Прыляжаеў*, Я.М.*Рахманько*, У.С.*Салдатаў*, В.В.*Свірыдаў*, Р.Л.*Старобінец*, В.Ф.*Цікавы*, І.Р.*Цішчанка*, М.Ф.*Ярмоленка*, І.М.*Ярмоленка* і інш. Выдаюцца час. «Весці Нац. акадэміі навук Беларусі. Серыя хімічных навук» (з 1965), «Вестник БГУ. Серия 2. Химия, биология, география» (з 1969). У 1993 у Мінску адбыўся 15-ы Мендзялееўскі кангрэс па хім. праблемах экалогіі.

Літ.: Джуа М. История химии: Пер. с итал. М., 1975; Волков В.А., Вонский Е.В., Кузнецова Г.И. Выдающиеся химики мира: Биогр. справ. М., 1991; Поиск химической информации. М., 1990; Бучаченко А.Л. Химия на рубеже веков: свершения и прогнозы // Успехи химии. 1999. Т. 68, № 2.

А.І.Васілеўская.

ХІМІЯ ВЫСОКАМАЛЕКУЛЯ́РНЫХ ЗЛУЧЭ́ННЯЎ, раздзел *хіміі*, які вывучае спосабы атрымання, структуру і ўласцівасці рэчываў, малекулы якіх складаюцца з вял. колькасці звёнаў, злучаных паміж сабой хім. сувязямі. Разглядае асаблівасці ў агульных хім. заканамернасцях, паняццях і метадах, выкліканых макрамалекулярнай будовай сінт. і прыродных рэчываў.

Х.в.з. уключае раздзелы, якія вывучаюць: макрамалекулярную структуру (канфігурацыя, канфармацыя, гнуткасць, малекулярная маса); надмалекулярную структуру аморфных і крышт. палімераў; метады атрымання палімераў (*полімерызацыя* радыкальная, іонная і іонна-каардынацыйная, *полікандэнсацыя*, полімераналагічныя пераўтварэнні); хім. і фіз. дэструкцыі; старэнне і стабілізацыю палімераў; эксплуатацыйныя ўласцівасці арыентаваных і ізатропных палімерных матэрыялаў у залежнасці ад іх структуры. Тэхналогія высокамалекулярных злучэнняў грунтуецца на хіміі і фізіцы палімераў і ўключае сінтэз палімернага рэчыва, увядзенне ў яго дапаможных рэчываў (стабілізатараў, пластыфікатараў, фарбавальнікаў і інш.) і наданне яму формы (плёнкі, валакна, вырабу) з пэўнай надмалекулярнай структурай, якая разам з хім. будовай макрамалекул абумоўлівае эксплуатацыйныя ўласцівасці матэрыялаў і вырабаў.

Літ.: Кулезнев В.Н., Шершнев В.А. Химия и физика полимеров. М., 1988; Тугов И.И., Кострыкина Г.И. Химия и физика полимеров. М., 1989; Киреев В.В. Высокомолекулярные соединения. М., 1992.

М.Р.Пракапчук.

ХІМІЯ ДРАЎНІ́НЫ І ЦЭЛЮЛО́ЗЫ, навука аб саставе, будове і хім. уласцівасцях *драўніны* і яе кампанентаў; тэарэт. аснова вытв-сцей хім. і хім.-мех. перапрацоўкі драўніны. Разглядае асн. састаўныя ч. драўніны (*цэлюлозу, геміцэлюлозу, лігнін*; складаюць да 95% сухой масы) і другарадныя (экстракцыйныя рэчывы — таніны, тэрпеноіды, караціноіды, пігменты, вітаміны, ліпіды, бялкі, вугляводы; 5—10%). Хім. метадамі атрымліваюць з драўніннай сыравіны больш за 20 тыс. прадуктаў і вырабаў.

На Беларусі даследаванні па пытаннях Х.д. і ц. вядуцца ў ін-тах Нац. АН, Бел. тэхнал. ун-це, БСГА. Створаны гарачаўстойлівыя і сарбцыйныя валокны, новыя мед. прэпараты з цэлюлозы (І.М.*Ярмоленка*, Ф.М.*Капуцкі*); вывучана трываласць валокнаў і плёнак з цэлюлозы (Д.У.Жаркоўскі). Распрацаваны метад дэлігніфікацыі драўніны і спосабы утылізацыі лігніну (А.І.*Скрыган*, А.І.*Валожын*, У.М.Рэзнікаў), мадыфікацыі драўніны сінт. палімерамі і ператварэння яе поліцукровых кампанентаў (В.Я.Віхроў, Я.П.Марозаў). Гл. таксама *Лесахімія*.

Літ.: Никитин Н.И. Химия древесины и целлюлозы. М.; Л., 1962; Химия древесины: Пер. с фин. М., 1982; Фенгел Д., Вегенер Г. Древесина: Химия. Ультраструктура. Реакции: Пер. с англ. М., 1988; Капуцкий Ф.Н., Юркштович Т.Л. Лекарственные препараты на основе производных целлюлозы. Мн., 1989.

Я.Г.Міляшкевіч.

ХІМІЯ КААРДЫНАЦЫ́ЙНЫХ ЗЛУЧЭ́ННЯЎ, раздзел *хіміі*, які вывучае ўласцівасці *каардынацыйных злучэнняў* і спосабы іх атрымання.

Са стараж. часоў людзі выкарыстоўвалі прыродныя каардынацыйныя злучэнні ў побыце, медыцыне і вытв-сці. У 18—19 ст. гэтыя злучэнні пачалі мэтанакіравана сінтэзаваць; узнікалі тэорыі, якія тлумачылі іх будову. У 1893 А.*Вернер* прапанаваў каардынацыйную тэорыю, якая грунтуецца на ўяўленнях аб каардынацыі, «галоўнай» і «пабочнай» валентнасці, каардынацыйнай лічбе, унутр. і знешняй сферах, геаметрыі комплексных малекулы. Уклад у развіццё Х.к.з. зрабілі Л.А.*Чугаеў*, Э.О.*Фішэр*, Г.*Таўбе* і інш. Найб. актыўна развіваюцца кірункі Х.к.з. — металакомплексны аналіз, каардынацыйная хімія паверхні, біянеарган. хімія і інш.

На Беларусі даследаванні пачаліся ў 1950-я г. ў БДУ і Ін-це хіміі, вядуцца ў ін-тах хім. профілю Нац. АН, БДУ, Бел. тэхнал. ун-це. Вывучаюцца фотахім. і радыяцыйна-хім. пераўтварэнні каардынацыйных злучэнняў у водных растворах; комплексаўтварэнне галагенідаў металаў у газавай фазе; сінтэз матэрыялаў з каштоўнымі ўласцівасцямі (ферамагнетызм, тэрмахімізм, біял. актыўнасць) і інш.

Літ.: Кукушкин В.Ю., Кукушкин Ю.Н. Теория и практика синтеза координационных соединений. Л. 1990; Костромина Н.А., Кумок В.Н., Скорик Н.А. Химия координационных соединений. М., 1990; Логинова Н.В. Бионеорганическая химия: металлокомплексы в медицине. Мн., 2000.

Н.В.Логінава.

ХІМІЯ ТО́РФУ, навука пра састаў і хім. ўласцівасці *торфу*, якія вызначаюць асн. кірункі перапрацоўкі тарфяной сыравіны з мэтай атрымання разнастайных прадуктаў і матэрыялаў для розных галін гаспадаркі.

Асн. кірункі навук. распрацовак: сувязь хім. саставу з відам і тыпам торфу; хімія *гумінавых кіслот*, піроліз торфу; вытв-сць біялагічна актыўных рэчываў гумінавага паходжання, тэхналогіі атрымання воску, прэпаратаў

для медыцыны, быт. хіміі, сарбцыйных матэрыялаў для ачысткі сцёкавых вод ад нафтапрадуктаў і іонаў цяжкіх металаў, фарбавальнікаў і інш. Вял. клас арган. злучэнняў торфу — бітумаў, вугляводаў, гумінавых рэчываў — вызначае яго каштоўнасць як хім. сыравіны і арган. ўгнаення. Тэрмічная перапрацоўка торфу дазваляе атрымліваць тэхнал. газ, вадкае паліва, кокс, вугляродныя сарбенты і інш.

На Беларусі як самаст. галіна хіміі пачала фарміравацца з 1912 на *Мінскай балотнай доследнай станцыі*. З 1932 даследаванні па Х.т. вядуцца ў Ін-це праблем выкарыстання прыродных рэсурсаў і экалогіі Нац. АН. Уклад у фарміраванне і развіццё навук. даследаванняў па Х.т. зрабілі П.І.*Бялькевіч*, У.Я.*Ракоўскі*, І.І.*Ліштван* і інш. Гл. таксама *Торфяная прамысловасць*, *Торфаздабыча*, *Торфалячэнне*.

Літ.: Ліштван И.И., Король Н.Т. Основные свойства торфа и методы их определения. Мн., 1975; Раковский В.Е., Пигулевская Л.В. Химия и генезис торфа. М., 1978; Тишкович А.В. Использование торфа в сельском хозяйстве. Мн., 1984; Белькевич П.И., Голованов Н.Г., Долидович Е.Ф. Битумы торфа и бурого угля. Мн., 1989. *І.І.Ліштван.*

ХІ́МІЯ ЦВЁРДАГА ЦЕ́ЛА, навука аб сінтэзе, фізіка-хім. уласцівасцях і выкарыстанні рэчываў, якія знаходзяцца ў цвёрдым агрэгатным стане.

Як самаст. галіна *хіміі* сфарміравалася ў 1970-я г. на базе даследаванняў механізму і кінетыкі хім. рэакцый з удзелам *цвёрдых цел*, у т.л. найб. пашыраных з іх — тапахім. рэакцый (хоць бы 1 рэагент у цвёрдым стане). Асн. задача Х.ц.ц. — сінтэз рэчываў у цвёрдым стане пэўнага саставу, з зададзенай структурай (што вызначае рэакцыйную здольнасць цвёрдага цела). Састаўной часткай Х.ц.ц. з'яўляецца атрыманне інфармацыі аб уплыве структуры цвёрдых цел на іх рэакцыйную здольнасць і ўласцівасці, вывучэнне механізму дыфузіі ў цвёрдых целах і фазавых пераходаў. Да рэакцый, якія вывучаюцца і выкарыстоўваюцца на практыцы з удзелам цвёрдых цел, адносяцца: працэсы абпальвання, аднаўлення, хларавання руд металаў, цэментацыя сталі; прыгатаванне каталізатараў; сінтэз і ачыстка паўправадніковых матэрыялаў, тэмплатны сінтэз цвёрдых цел; атрыманне нанапорыстых мембран і цэалітаў і інш. Найб. пашыраныя метады даследавання: рэнтгена- і электронаграфія, электронная мікраскапія, тэрмічны аналіз, спектральныя метады (напр., ядзерная спектраскапія), ізатопны метад вывучэння дыфузіі і інш.

На Беларусі даследаванні па Х.ц.ц. праводзяцца ў Ін-це фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў Нац. АН, БДУ і інш. Значны ўклад у фарміраванне і развіццё Х.ц.ц. зрабілі Б.В.*Ерафееў*, М.М.*Паўлючэнка*, В.В.*Свірыдаў*, *А.І.Лесніковіч*.

Літ.: Дельмон Б. Кинетика гетерогенных реакций: Пер. с фр. М., 1972; Гилевич М.П., Покровский И.И. Химия твердого тела. Мн., 1985; Вест А.Р. Химия твердого тела: Теория и приложения: Пер. с англ. Ч. 1—2. М., 1988; Крапухин В.В., Соколов И.А., Кузнецов Г.Д. Технология материалов электронной техники: Теория процессов полупроводниковой технологии. М., 1995. *Т.М.Вараб'ёва.*

ХІМІЯТЭРАПЕЎТЫ́ЧНЫЯ СРО́ДКІ, лекавыя сродкі, якія ўжываюць для барацьбы з інфекц. і паразітарнымі хваробамі, злаякаснымі пухлінамі. Спецыфічна ўплываюць на пэўныя віды бактэрый, вірусаў, грыбкоў, клетак пухлін і інш. Першы Х.с. — процісіфілітычны прэпарат «606» (сальварсан) прапанаваны П.*Эрліхам*. Вылучаюць антыбактэрыяльныя, процівірусныя, процігрыбковыя, проціпаразітарныя (процімалярыйныя, проціамёбныя, процітрыхаманадныя), *проціпухлінныя сродкі* і інш. Да Х.с. адносяцца рэчывы прыроднага паходжання — *антыбіётыкі* і *алкалоіды*, таксама сінт. сродкі — *сульфаніламіды*, вытворныя фторхіналонаў, нітрафурану, нітрозамачавіны і інш. Тармозяць сінтэз нуклеінавых кіслот, бялку, клетачнай сценкі бактэрый, пашкоджваюць цытаплазматычныя мембраны і інш. Працяглае выкарыстанне Х.с. суправаджаецца развіццём алергічных і нейратаксічных рэакцый, імунадэфіцытных станаў і інш. Х.с. лечаць хворых (*хіміятэрапія*), папярэджваюць інфекц. і інвазійныя хваробы (хіміяпрафілактыка).

І.М.Семяненя, А.Р.Давыдоўскі.

ХІМІЯТЭРАПІ́Я (ад *хімія* + *тэрапія*), раздзел фармакатэрапіі; лячэнне інфекц., паразітарных хвароб і пухлін *хіміятэрапеўтычнымі сродкамі*. Тэрмін прапанаваў у пач. 20 ст. П.*Эрліх*. Напачатку з'явілася Х. інфекц. хвароб, пазней — злаякасных хвароб. Задачы Х.: адшуканне новых хіміятэрапеўт. сродкаў, распрацоўка спосабаў іх атрымання, вывучэнне спектра і механізмаў дзеяння гэтых сродкаў на ўзбуджальнікаў заразных хвароб і пухлінныя клеткі, а таксама выпрацоўка рацыянальных метадаў іх выкарыстання. Цесна звязана з фармакалогіяй, мікрабіялогіяй, паразіталогіяй, імуналогіяй і інш.

І.М.Семяненя, А.Р.Давыдоўскі.

ХІ́МКІ, горад у Маскоўскай вобл., у Расіі, на канале імя Масквы. Узнік у 1850 як пасёлак на чыгунцы Масква—С.-Пецярбург. З 1938 горад. 135,8 тыс. ж. (2001). Прам-сць: машынабудаванне (ракетныя рухавікі для навук. спадарожнікаў, інструменты, апрацоўчыя машыны, рамонт гандл. тэхнікі), хім. (пластмасавыя вырабы), дрэваапр., лёгкая, харчовая. Маскоўскі ін-т культуры, факультэт Маскоўскага ін-та прыладабудавання. Помнікі архітэктуры: Уладзімірская царква (1678), царква Казьмы і Даміяна (1730).

ХІ́МУС (ад грэч. chymos сок), вадкае або паўвадкае змесціва тонкіх кішак пазваночных жывёл і чалавека. Складаецца з сумесі прадуктаў ператраўлення ежы ў страўніку, жоўці, сакрэтаў падстраўнікавай і кішэчных залоз, злушчанага эпітэлію і мікраарганізмаў, а таксама ферментаў панкрэатычнага соку і ўласна кішэчных. Састаў Х. залежыць ад характару харчавання і стану сакраторнай дзейнасці стрававальнага апарату. Маторная дзейнасць кішэчніка садзейнічае перамешванню Х. і яго перамяшчэнню. У чалавека за суткі з тонкіх кішак у тоўстую пераходзіць каля 400 г Х.

ХІМЫ́, вёска ў Бабруйскім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 13 км на У ад г. Бабруйск, 95 км ад Магілёва, 13 км ад чыг. ст. Бярэзіна. 349 ж., 140 двароў (2003). Сярэдняя школа, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў.

ХІМ'ЯРЫ́ЦКАЕ ЦА́РСТВА, старажытная дзяржава, якая існавала ў 2 ст. да н.э. — 6 ст. н.э. Узнікла ў канцы 2 ст. да н.э. на ПдЗ Аравіі. У пач. 1 ст. да н.э. хім'ярыты захапілі ўсе пункты марскога гандлю на паўд.-зах. узбярэжжы Паўд. Аравіі, частку ўзбярэжжа Усх. Афрыкі і ч. тэр. *Сабейскага царства* (Сабы). У канцы 2 ст. н.э. аб'яднаныя сілы *Аксумскага царства*, Хадрамаўта і Сабы разбілі армію Х.ц. і зрабілі яго залежным ад Сабы. У пач. 4 ст. ўся Паўд. Аравія зноў трапіла пад уладу Х.ц. У пач. 6 ст. тэр. хім'ярытаў заваявалі эфіопы, у 2-й пал. 6 ст. — *Сасаніды*.

ХІНАЛІ́Н, гетэрацыклічнае арганічнае злучэнне. Змяшчаецца ў кам.-вуг. смале. Ядро Х. — структурны фрагмент хіналінавых алкалоідаў, напр., *хініну*.

Бясколерная вадкасць з характэрным саладкаватым пахам, $t_{кіп}$ 237 °С. Растворацца ў этаноле, дыэтылавым эфіры, бензоле, слаба — у вадзе. Гіграскапічны. Моцная аснова, утварае солі з неарган. к-тамі. Вытворныя Х. — аснова для вытв-сці лек. сродкаў (напр., энтэрасептолу, трыхаманацыду). Выкарыстоўваецца для сінтэзу цыянінавых фарбавальнікаў, як растваральнік для серы, фосфару і інш.



ХІНАСТЭ́РА (Ginastera) Альберта Эварыста (11.4.1916, Буэнас-Айрэс — 25.6.1983), аргенцінскі кампазітар, педагог. Чл. Нац. акадэміі выяўл. мастацтва і музыкі (1957), Браз. акадэміі музыкі (1958), Амер. акадэміі мастацтваў і л-ры (1968). Скончыў Нац. кансерваторыю ў Буэнас-Айрэсе (1938). У 1948—58 дырэктар засн. ім кансерваторыі ў г. Ла-Плата, з 1965 адзін з арганізатараў і дырэктар Лац.-амер. цэнтра муз. даследаванняў «Тарквата ды Тэлья». Творчасці характэрны сувязь з нар. арг. музыкай, сінтэз лац.-амер. спецыфікі, сучаснай кампазіцыйнай тэхнікі і нац. элементаў. Сярод твораў: оперы «Дон Радрыга» (паст. 1964), «Беатрыс Чэнчы» (паст. 1971) і інш.; балеты, у т.л. «Панамбі» (паст. 1952); кантаты; канцэрт для стр. (1965); канцэрты для фп., скрыпкі, віяланчэлі і арфы з арк.; камерна-інстр. ансамблі; фп. п'есы; рамансы.

ХІНАЯ́НА (санскр., літар. — малая калясніца, вузкі шлях), адзін з асноўных (разам з махаянай) кірункаў *будызму*. Узнікла ў пач. н.э. на ПнУ Індыі і Цэйлоне, пазней распаўсюдзілася ва ўсіх азіяцкіх краінах. У 5—6 ст. на Пн выцеснена махаянай, але канчаткова зама-

цавалася ў Паўд.-Усх. Азіі, на Цэйлоне, у Бірме, Лаосе, Тайландзе.

У аснове Х. — будыйская ідэя пра 2 станы быцця: праяўлены і непраяўлены (непраяўлены атаясамліваюць з хваляваннем дхармаў — пэўных адзінак жыццядзейнасці асобы). У Х. «Я» і свет разглядаюцца як хуткамінучыя камбінацыі, адмаўляецца душа як самаст. духоўная сутнасць, адначасова падкрэсліваецца рэальнасць дхармаў. Для будызму характэрна ідэя незалежнага развіцця асобы, асабістага ўдасканалення дзеля дасягнення *нірваны*. Буда ў Х. — гіст. асоба, якая адрозніваецца ад інш. большай дасканаласцю як узор для іншых (патэнцыяльна кожны чалавек можа стаць Будай). Найб. значныя школы Х.: тхеравада (найб. блізкая да першапачатковага будызму), вайбхашыка, саўнтрантыка. *Н.К.Мазоўка.*

ХІНГА́НСКІ ЗАПАВЕ́ДНІК. У Амурскай вобл. (Расія), у перадгор'і хрыбта Малы Хінган. Засн. ў 1963 для аховы прыроднага комплексу Сярэдняга Прыамур'я. Пл. 97,8 тыс. га. Клімат мусонны. Рэльеф вызначаюць Хінганскае нізкагор'е (выш. каля 500 м) і забалочаная раўніна. Глебы горна-лясныя бурыя і лугавыя чарназёмападобныя. Дубовыя і хвойна-шыракалістыя лясы займаюць 76% горнай ч. запаведніка. Захаваліся невял. ўчасткі лесу з хвоі кедравай карэйскай, елкі аянскай, піхты белакорай, лістоўніцы даурскай. У поймах рэк — вербнякі, алешнікі і ясянёва-ільмавыя насаджэнні. На раўніне лугавая і балотная расліннасць. У флоры больш за 800 відаў; у Чырв. кнізе: чаравічкі буйнакветкавы і сапраўдны, барадатка японская, надбароднік бязлісты, чылім, лотас Камарова. Звычайныя прадстаўнікі фауны прыамурскай (чорны мядзведзь, харза, янотападобны сабака) і манголадаурскай (даурскі хамячок, даўгахвосты суслік). У Чырв. кнізе: сапсан, скапа, арлан-белахвост, мандарынка, далёкаўсходні белы бусел, японскі і даурскі журавлі.

ХІ́НДЗІ МО́ВА, адна з *індыйскіх моў*. Афіц. і адна з асн. моў Індыі. Існуе 2 групы дыялектаў: зах. і ўсх., якія маюць значныя структурныя адрозненні. Х.м. ўласцівы: у фанетыцы — сэнсаадрознівальная працягласць і назалізацыя галосных; у марфалогіі — мноства аналіт. форм імя і дзеяслова; у сінтаксісе — эргатыўная канструкцыя сказа з выказнікам у форме дзеяслова закончанага трывання залежнага стану. У адрозненне ад блізкароднаснай *урду мовы* Х.м. шырока выкарыстоўвае санскрыцкія лексічныя і словаўтваральныя сродкі. Сучасная літ. Х.м. пачала фарміравацца ў пач. 19 ст. Пісьменнасць на аснове алфавіту дэвангары (гл. *Індыйскае пісьмо*).

Літ.: Катенина Т.Е. Язык хинди. М., 1960. *А.Я.Міхневіч.*

ХІНДУСТА́Н, 1) назва *Індыі* (у процівагу ўстарэламу Індастан). 2) Назва Паўн. Індыі (у процілегласць Дэкану). 3) Гіст. вобласць рассялення хіндустанцаў, якая ўключала даліну р. Ганг ад раёна Дэлі да раёна Варанасі (Бенарэса).

ХІ́НДЭМІТ (Hindemith) Паўль (16.11.1895, г. Ганаў, Германія — 28.12.1963), нямецкі кампазітар, альтыст, дырыжор, муз. тэарэтык; вядучы прадстаўнік ням.

П.Хіндэміт.

неакласіцызму. Вучыўся ў кансерваторыі г. Франкфурт-на-Майне. З 1915 2-і скрыпач квартэта А.Рэбнера, у 1921—29 альтыст стр. квартэта Л.Амара — П.Хіндэміта. З 1927 праф. Вышэйшай муз. школы ў Берліне. З 1938 працаваў у Швейцарыі і ЗША. Творы Х. вылучаюцца гармоніяй, стрыманасцю пачуццяў, у шматлікіх з іх уздымаў грамадска-паліт. і філас. праблемы. Звяртаўся да быт. аматарскай музыкі. Сярод твораў: оперы (каля 10), у т.л. «Навіны дня» (паст. 1929; 2-я рэд. 1954), «Мастак Матыс» (паст. 1938), «Гармонія свету» (паст. 1957); балеты; 6 сімфоній (1930—58); канцэрты; камерна-інстр. ансамблі, у т.л. творы для фп.; хар. творы; музыка для аматарскіх аркестраў, ансамбляў і інш. Аўтар кніг «Кіраўніцтва па кампазіцыі» (т. 1—3, 1937—70), «Свет кампазітара» (1952), падручнікаў па тэорыі музыкі і гармоніі.

Літ.: Левая Т.Н., Леонтьева О.Т. П.Хиндемит. М., 1974; П.Хиндемит: Статьи и материалы. М., 1979.

ХІ́НІ (Heaney) Шэймас Джастын (н. 13.4.1939, Мосбан, Вялікабрытанія), ірландскі пісьменнік. Вывучаў філалогію ў Ландандэры і Белфасце. Працаваў у Гарвардскім і Оксфардскім ун-тах. Піша на англ. мове. У паэт. зб-ках «Адзінаццаць вершаў» (1965), «Смерць натураліста» (1966), «Дзверы ў цемру» (1969), «Зіма на зыходзе» (1972), «Поўнач» (1975), «Праца ў полі» (1979) вобразы роднай прыроды, побыт сялян, асэнсаванне паліт. падзей у Паўн. Ірландыі. У вершах і паэмах зб-каў «Станцыя Востраў» (1984), «Глогавая ліхтарня» (1987), «Бачанне рэчаў» (1991), «Працяг: новыя вершы, 1991 — 1996» (1996) і інш. імкненне да універсалізацыі тэматыкі, філас. асэнсаванне ірл. міфалогіі, ускладненая метафарычная мова. Аўтар кніг эсэ «Заклапочанасць» (1980), «Уладаранне мовы» (1988). Нобелеўская прэмія 1995. *Л.П.Баршчэўскі.*

ХІНІ́Н, алкалоід кары *хіннага дрэва*.

Солі Х. — бясколерныя крышталі або белы крышт. парашок без паху, вельмі горкага смаку. Растваральныя ў вадзе (лягчэй у гарачай) і спірце. У медыцыне выкарыстоўваюць як процімалярыйны сродак (Х. сульфат, гідра- і дыгідрахларыд), для ўзбуджэння і ўзмацнення родавай дзейнасці, прыгнечвае функцыі ц.н.с., аказвае гарачкапаніжальнае і проціарытмічнае дзеянне і інш. *І.М.Семяненя.*

ХІ́ННАЕ ДРЭ́ВА, цынхона (Cinchona), род кветкавых раслін сям. марэнавых. Каля 40 відаў. Пашыраны ў Паўд. Амерыцы. З 19 ст. культывуюцца ў Індыі, Інданезіі (асн. маса сусв. здабычы *хініну*) Х.д.: Леджэра (C.ledgeriana), лекавае (C.officinalis), чырванакорае (C. succirubra) і інш.

Дрэвы выш. 10—15, да 25 м. Лісце супраціўнае, скурыстае, суцэльнакрайняе. Кветкі ў несапраўдных парасоніках, сабраных у мяцёлкі. Плод — каробачка. Кара і інш. ч. Х.д. маюць да 30 *алкалоідаў* (найважн. — хінін), якія выкарыстоўваюцца ў медыцыне. Шляхам селекцыі ўтрыманне хініну павялічылася з 2—2,5 да 16%. З развіццём хім. сінтэзу алкалоідаў культура Х.д. скарачаецца. Лек. расліны.

Галінка **хіннага дрэва** чырванакорага.

ХІНО́НЫ, цыклічныя дыкетоны, у малекулах якіх кетагрупы ўваходзяць у сістэму спалучаных падвойных сувязей. Структурны фрагмент прыродных рэчываў (напр., вітамінаў гр. К), арган. пігментаў.

Афарбаваныя (*пара*-Х. — жоўтыя, *орта*-Х. — чырв.) крышталічныя лятучыя рэчывы з рэзкім пахам. Вельмі рэакцыяздольныя.



Акісляльнікі, схільныя да комплексаўтварэння, уступаюць у дыенавы сінтэз. Атрымліваюць акісленнем араматычных вуглевадародаў ці оксі- і амінавытворных. Выкарыстоўваюць у вытв-сці антрахінонавых фарбавальнікаў, як фунгіцыды, інсектыцыды, дубільныя рэчывы, акісляльнікі.

ХІНТ (Hint) Ааду (10.1.1910, в-аў Муху, Эстонія — 26.10.1989), эстонскі пісьменнік. Нар. пісьменнік Эстоніі (1965). Аўтар раманаў «Праказа» (1934), «Залатыя вароты» (1937), «Качагар» (1939),

А.Хінт.

С.Н.Хіншэлвуд.

зб-каў навел і апавяд. «Дзікія гусі» (1945), «Апошні карсар» (1970), п'ес «Куды ідзеш, таварыш дырэктар?» (1949), «Прадраканне» (1969), «Котэрман» (1972) і інш., нарысаў, твораў для дзяцей. У тэтралогіі «Бераг вятроў» (т. 1—4, 1951—66; асобныя тамы інсцэніраваны і экранізаваны) на лёсах некалькіх пакаленняў рыбацкага роду Тыху паказаны гіст. шлях эст. народа з 1905 да 1940. У паэтыцы эпапеі спалучэнне рэаліст. бытапісання, псіхал. і лірычнага пачаткаў. На бел. мову асобныя яго творы пераклалі Л.Арабей, Р.Раманоўская, В.Сёмуха. Дзярж. прэміі Эстоніі 1950, 1967.

Тв.: Бел. пер. — Бераг вятроў. Мн., 1960; Рус. пер. — Берег ветров. Кн. 1—4. М., 1970; Клятва. М., 1970; Последний пират. М., 1972; Свой остров. М., 1983.

Літ.: Крахмальникова З. Путешествие по «Берегу ветров»: (Ааду Хинт и его книги). М., 1970.

ХІНШЭЛВУД (Hinshelwood) Сірыл Норман (19.6.1897, Лондан — 9.10.1967), англійскі фізікахімік; адзін са стваральнікаў тэорыі ланцуговых рэакцый. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1929) і яго прэзідэнт (1955—60). Замежны чл. АН СССР (1958). Скончыў Бейліёл-каледж Оксфардскага ун-та (1924), дзе працаваў з 1921 (з 1937 праф.). З 1964 у Імперскім каледжы навукі і тэхналогіі (Лондан). Навук. працы ў галіне хім. кінетыкі. Выявіў механізм гамагеннага монамалекулярнага раскладання многаатамных малекул, з'явы мяжы ўзгарання вадароду ў сумесі з кіслародам і растлумачыў іх на аснове тэорыі ланцуговых рэакцый. Вывучаў працэсы росту бактэрый у пажыўных асяроддзях, выявіў залежнасць скорасці росту клетак ад наяўнасці ў навакольным асяроддзі вуглякіслага газу, амінакіслот і інш. Нобелеўская прэмія 1956 (з М.М.*Сямёнавым).*

ХІ́ПІ (англ. адз. лік hippie), групы моладзі, якія адмаўляюць некат. каштоўнасці і нормы паводзін сучаснай цывілізацыі ў духу *контркультуры*. Рух Х. ўзнік у 2-й пал. 1960-х г. у ЗША як мірна-пасіўны пратэст супраць грамадства матэрыяльнага дабрабыту і спажывання, прагматычных каштоўнасцей. Сімвалам руху стала кветка. Х. выступалі за свабоднае, натуральнае жыццё, аб'ядноўваліся ў абшчыны (адна з іх і цяпер дзейнічае ў Капенгагене). У пераносным сэнсе Х. — чалавек, які экстравагантна сябе паводзіць, разбэшчаны і неахайна апрануты. Ужо ў 1960-я г. пачалася камерцыялізацыя контркультуры Х., найперш у модзе.

Літ.: Забриски Пойнт: [О движении хиппи 60-х гг.: Альманах]. М., 1993; Рожанский Ф.И. Сленг хиппи: Материалы к словарю. СПб.; Париж, 1992. *У.Я.Калаткоў.*

ХІРА́ГАНА, гл. ў арт. *Японскае пісьмо.*

ХІРА́ЛЬНАСЦЬ у хіміі, здольнасць аб'екта (малекулы ці яе фрагмента) быць несумяшчальным са сваім адлюстраваннем у ідэальным плоскім люстэрку; адно з асн. паняццяў *стэрэахіміі*. Хіральныя малекулы існуюць у выглядзе пар энантыямераў, якія адрозніваюцца толькі знакам аптычнага вярчэння (гл. *Аптычная актыўнасць*). Малекула з некалькімі хіральнымі фрагментамі існуе ў выглядзе дыястэрэамераў, якія адрозніваюцца фіз. і хім. ўласцівасцямі. Усе біямалекулы хіральныя, што ўлічваецца ў біяхім., фармакалагічным і інш. сінтэзах.

ХІРАМА́НТЫЯ (ад грэч. cheir рука + manteia варажба), прадказанне будучага і вызначэнне характару чалавека па лініях і бугарках на далонях рук.

ХІРАСІ́МА, Хіросіма, горад у Японіі, на ПдЗ в-ва Хонсю. Адм. ц. прэфектуры Хірасіма. 1109 тыс. ж. (1995). Порт у дэльце р. Ота. Важны транспарт. прамысл. і культ. цэнтр. Аэрапорт. Прам-сць: судна- і станкабудаванне, аўтамаб., ваен., гумава-тэхнічная, дрэваапр., папяровая, тэкст., харч., паліграфічная. Ун-т. Парк Міру (1951—52) — арх.-паркавы сімвалічны ансамбль са шматлікімі скульптурамі, кенатафам, Вечным агнём, Фантанам малітвы, мемарыяльным музеем Міру. Каркас прамысл. выставачнай залы (адзіны будынак, ацалелы ў час бамбардзіроўкі; вядомы як Атамны Дом). Фестываль Міру (6 жніўня).

Засн. ў 1580—1610 як прызамкавы горад і порт. Зручнае размяшчэнне спрыяла развіццю гандлю, рамяства, прам-сці. У 2-ю сусв. вайну падвергнуты атамнай бамбардзіроўцы (6.8.1945) амер. авіяцыяй. Ад выбуху загінула больш за 200 тыс. чал., разбурана каля 75 тыс. будынкаў; многія жыхары памерлі пасля вайны ад хвароб, звязаных з радыяцыяй. Адбудавана, на месцы выбуху атамнай бомбы ў Х. ўзведзены мемарыяльны комплекс Міру. З 1959 у Х. адбываюцца міжнар. канферэнцыі аб забароне атамнай зброі.

Літ.: Искендеров А.А. Феодальный город Японии XVI столетия. М., 1961; Брукнер К. Садако хочет жить!: Пер. с нем. М., 1964.

ХІРА́СКА Юлія Уладзіміраўна (14.5.1906, в. Омельна Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. — 26.10.1985), бел. артыстка балета. Вучылася ў прыватнай харэагр. студыі К.*Алексютовіча* (1921—25). З 1921 артыстка балета БДТ-1, з 1930 салістка Дзярж. эстрады, у 1933—59 — Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Танцоўшчыца характарнага плана. У складзе творчых брыгад удзельнічала ў пастаноўцы балетаў «Салавей» М.Крошнера, «Палымяныя сэрцы» В.Залатарова. Сярод партый: Хмара («Князь-возера» Залатарова), Тао Хоа («Чырвоны мак» Р.Гліэра), Чага («Князь Ігар» А.Барадзіна), Сяброўка («Капелія» Л.Дэліба), а таксама характарныя танцы ў балетах «Раймонда» А.Глазунова, «Канёк-Гарбунок» Ц.Пуні, «Арлекінада» Р.Дрыга. *Дз.М.Жураўлёў.*

ХІРАТО́НІЯ (грэч. cheirotonia дзеянне сілай рук), тое, што *рукапалажэнне.*

ХІРАХІ́ТА (дэвіз праўлення Сёва; 29.4.1901, Токіо — 7.1.1989), імператар Японіі ў 1926—89. З 1921 у сувязі з хваробай бацькі (імператара Іасіхіта) з'яўляўся прынцам-рэгентам; у 1926 заняў трон (каранаваны ў 1928). Пасля паражэння Японіі ў 2-й сусв. вайне застаўся на троне, але паводле канстытуцыі 1947 яго ўлада абмежавана парламентам і кабінетам міністраў; афіцыйна Х. прыняў тытул — «сімвал дзяржавы і адзінства народа».

Літ.: Бикс Г. Хирохито и создание современной Японии: Пер. с англ. М., 2002.

ХІРО́СІГЭ Анда (1787 або 1797, Токіо — 12.10.1858), японскі графік; буйнейшы прадстаўнік *укіё-э*. Ствараў каляровыя дрэварыты, распрацаваў новы для яп. мастацтва тып камернага пейзажа, прасякнутага тонкім лірычным пачуццём: серыі «10 відаў Усходняй сталіцы» (1827), «53 станцыі дарогі Такайда» (1833—34), «Больш 60 відаў правінцый» (1852—56), «36 відаў гары Фудзі» (1854—58), «100 відаў Эда» (1856—58). У творах віртуозна выкарыстоўваў тэхнікі ціснення і расцяжкі колеравых плям для перадачы эфектаў снегу, дажджу, туману і інш.

ХІРУРГІ́ЧНЫЯ ІНСТРУМЕ́НТЫ, інструменты і прыстасаванні, якія выкарыстоўваюцца пры *аперацыях хірургічных*. Падзяляюцца на агульныя і дапаможныя.

Да агульных адносяць Х.і. для раз'ядноўвання тканак, фіксацыі і злучэння іх: скальпелі (у т.л. лазерныя, плазмавыя), нажніцы, электранажы, пілы (ліставыя, стужачныя, дыскавыя, драцяныя), іголкі (прамыя і выгнутыя, колючыя, рэжучыя, атраўматычныя); для спынення крывацёку — заціскачкі і апараты, лігатурныя іголкі і інш.; для зандзіра-

вання ран, раскрыцця касцявых поласцей і інш. Дапаможныя інструменты: пінцэты, расшыральнікі, брушныя і пячоначныя люстэркі, лапаткі-падымальнікі і інш. Х.і. з аптычным прыстасаваннем служаць для дыягностыкі і аператыўнага лячэння, узяцця матэрыялу на аналіз і інш. Існуюць таксама спец. Х.і. — нейрахірург., мікрахірург., сасудзістыя і інш.

ХІРУРГІ́ЧНЫЯ ХВАРО́БЫ, хваробы, пры якіх паталаг. ачагі ў арганізме чалавека ліквідуюцца з дапамогай *аперацый хірургічных* спец. *хірургічнымі інструментамі*. Да Х.х. адносяцца напр., *апендыцыт, газавая гангрэна, карбункул, перытаніт*. Вывучае Х.х. *хірургія*.

ХІРУРГІ́Я (ад грэч. cheir рука + ergon дзеянне, работа), галіна медыцыны і ветэрынарыі па вывучэнні хвароб і пашкоджанняў, асн. метад лячэння якіх — *аперацыя хірургічная*. Методыка аперацый пастаянна ўдасканальваецца, выкарыстоўваецца тэлескапічная тэхніка, эндаскапія і інш. Адрозніваюць Х. грудную, сардэчна-сасудзістую, мікрасасудзістую (гл. *Мікрахірургія*), брушную, *пластычную хірургію*, транспланталогію і інш. З Х. вылучыліся *анкалогія, артапедыя, нейрахірургія, траўматалогія, уралогія*.

На Беларусі Х. як форма арганізаванай мед. дапамогі вядома з канца 18 ст., навук. характар набыла ў 1920-я г. (У.В.*Бабук*, Я.В.*Корчыц*, У.В.*Марзон*, С.М.*Рубашоў*, М.П.*Сакалоўскі*). Навук. даследаванні па Х. праводзяцца ў мед. ун-тах, Бел. мед. акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Распрацаваны асн. прынцыпы хірург. службы на Беларусі. Укараненне новых метадаў лячэння ў Х. ажыццяўляецца ў асацыяцыі хірургаў (прэзідэнт С.І.*Леановіч*), Бел. акадэміі мед. навук. Уклад у развіццё Х. зрабілі П.М.*Маслаў*, А.М.*Саўчанка*, А.У.*Шот* і інш. (кардыяхірургія), Ц.Е.*Гніларыбаў*, С.І.Траццяк і інш. (транспланталогія), А.С.*Мішараў* (дзіцячая Х.), М.М.*Чур* (хірург. інфекцыя), Л.В.*Аўдзей*, М.І.*Батвінкоў*, П.В.*Гарэлік*, І.М.*Грышын*, І.Я.*Макшанаў*, Р.П.*Рычагоў*, *Р.П.Шорах* і інш. (Х.стрававода, страўніка, біліярнай сістэмы; колапракталогія, эндахірургія), В.Р.*Астапенка*, І.М.*Грышын*, А.А.*Грэйман*, Я.П.*Дзямідчык* (эндакрыналогія).

І.М.Грышын.

ХІТ, хіт-сонг (англ. hit удача, цвік сезона + song песня), жаргонная (сленгавая) назва песні (або якой-н. муз. кампазіцыі) у галіне забаўляльнай камерцыялізаванай музыкі, якая імгненна заваявала поспех (часам кароткачасовы); амаль тое, што і *шлягер*. Традыц. для ЗША т.зв. Х.-парады (канцэртныя праграмы, якія складаюцца з Х.) з канца 1980-х г. сталі папулярныя і ў краінах б. СССР.

ХІТ (Heath) Эдуард Рычард Джордж (н. 9.7.1916, Бродстэрс, Вялікабрытанія), дзяржаўны і паліт. дзеяч Вялікабрытаніі. Скончыў Оксфардскі ун-т. З 1950 дэп. парламента ад Кансерватыўнай партыі Вялікабрытаніі, у 1965—75 яе лідэр. У 1959—64 неаднаразова міністр, у 1970—74 прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі. Урад Х. імкнуўся абмежаваць правы рабочых на забастоўкі, падпісаў *Дагавор аб забароне размяшчэння ядзернай зброі на марскім дне* (1971), увёў прамое кіраванне *Паўночнай Ірландыяй* з Лондана (1972), дамогся ўступлення Вялікабрытаніі ў *Еўрапейскую эканамічную супольнасць* (1973).

«ХІТА́ЦІ», «Хітачы», японская электратэхнічная кампанія па вытв-сці прамысл. і быт. абсталявання, электратэхнікі, абсталявання сувязі; адна з вядучых у краіне манаполій па ядз. рэактарах. Засн. ў 1910. Мае больш як 100 з-даў у Японіі. Кампанія звязана з фін. групамі Фудзі і Санва. Аб'ём продажу 41,3 млрд. дол.; чысты прыбытак 964 млн. долараў. Больш за 15% сваёй прадукцыі экспартуе. У вытв-сці заняты 264 тыс. чал. (канец 1980-х г.).

ХІТО́Н (грэч. chitōn), 1) мужчынскае і жан. адзенне стараж. грэкаў у выглядзе кашулі з лёну ці шэрсці, часцей без рукавоў. Па баках часам сшываўся, на плячах сашчэпліваўся засцежкай ці завязкамі, па таліі перацягваўся поясам. Доўгі (да ступняў) Х. быў адзеннем старых і знатных людзей, жрацоў; маладыя людзі, рамеснікі і салдаты насілі кароткі Х. (да каленяў). Жаночы Х. быў доўгі, са шматлікімі зборкамі і прыгожай аздобай (каляровая аблямоўка, вышыўка і інш.). 2) Касцюм танцоўшчыцы балета з лёгкай тканіны з глыбокімі разрэзамі па баках.

ХІТО́НЫ, клас малюскаў; гл. *Панцырныя малюскі*.

Хітоны жаночы і мужчынскі.

ХІТРУ́К Фёдар Савельевіч (н. 1.5.1917, Масква), расійскі кінарэжысёр-аніматар, мастак. Нар. арт. Расіі (1977). Нар. арт. СССР (1987). Скончыў маст. тэхнікум (1937). У 1937—41 і з 1947 на кінастудыі «Саюзмультфільм». Арганізатар і кіраўнік мультыплікацыйнай майстэрні на Вышэйшых рэжысёрскіх і сцэнарных курсах; выкладае ў Школе-студыі «ШАР». Як мастак удзельнічаў у стварэнні каля 200 мультфільмаў. З 1961 рэжысёр маляваных фільмаў. Творчасць Х. адметная грамадзянскасцю тэмы, арыгінальнасцю выяўл. мовы, лаканічнасцю формы: «Гісторыя аднаго злачынства» (1962, прыз Усесаюзнага кінафестывалю, 1964), «Канікулы Баніфацыя» (1965, гал. прыз Усесаюзнага кінафестывалю, 1966), «Чалавек у рамцы» (1967), «Фільм, фільм, фільм!» (1968), «Вініпух» (серыя мультфільмаў, 1969—72),



А.Хіросігэ. Раптоўны лівень у Сона. З серыі «53 станцыі дарогі Такайда».

Ф.С.Хітрук. Кадр з фільма «Вініпух ідзе ў госці».

«Юнак Фрыдрых Энгельс» (1970, з В.Курчэўскім і мультыплікатарамі ГДР, прызы Міжнар. кінафестываляў у Лейпцыгу і Обергаўзене, Нац. прэмія ГДР, 1971), «Вострай» (1973, прызы Усесаюзнага і Міжнар. кінафестываляў у Кракаве, Польшча, Кане, Францыя, 1974), «Ікар і мудрацы» (1976, прыз Міжнар. кінафестывалю ў Лейпцыгу), «Дару табе зорку» (1979), «Леў і бык» (1983, прыз Усесаюзнага кінафестывалю, 1984) і інш. Піша сцэнарыі. Дзярж. прэміі СССР 1976, 1982.

Дж.Х. Хітчынгс.

ХІТРЫДЫЯ́ЛЬНЫЯ (Chytridiales), парадак хітрыдыевых грыбоў. 5 сям., каля 80 родаў, больш за 400 відаў. Пашыраны ўсюды. На Беларусі больш за 10 відаў з родаў *альпідый*, рызафідый і сінхітрый. Сапратрофы на расл. і жывёльных рэштках, паразіты на водных грыбах, мікраскапічных жывёлах і водарасцях; узбуджальнікі хвароб вышэйшых раслін — чорнай ножкі с.-г. культур і раку бульбы.

Вегетатыўнае цела ў выглядзе пратаплазменнай масы або авальнай ці цыліндрычнай клеткі, укрытай абалонкай, ад якой адыходзіць *міцэлій*. Бясполае размнажэнне адбываецца з дапамогай аднажгуцікавых зааспор, палавое (аагамія, гаметагамія, саматагамія) — у неспрыяльных умовах. *С.І.Бельская.*

ХІТРЫДЫЯМІЦЭ́ТЫ (Chytridiomycetes), клас сапраўдных грыбоў; пераважна аднаклетачныя і мікраскапічныя формы. 4 парадкі, 90 родаў, больш за 500 відаў. Пашыраны ўсюды. На Беларусі каля 20 відаў, у большасці з парадку *хітрыдыяльных*. Трапляюцца як сапратрофы ў вадзе, вільготным наземным асяроддзі, паразітуюць на грыбах, беспазваночных жывёлах, раслінах, выклікаюць хваробы с.-г. культур.

Вегетатыўнае цела накшталт *плазмодыя* або клетка са слабаразвітым бяз'ядзерным міцэліем, функцыі якога — прымацаванне да субстрату і паглынанне пажыўных рэчываў. Клетачная абалонка мае хіцін. Размнажэнне бясполае аднажгуцікавымі *зааспорамі*, што фарміруюцца ў зоаспарангіях, маюць разнастайную форму і будову; палавое — гаметагамія, аагамія, саматагамія. *С.І.Бельская.*

ХІ́ТЧЫНГС (Hitchings) Джордж Херберт (18.4.1905, г. Хоквім, ЗША — 27.2.1998), амерыканскі вучоны ў галіне біяхіміі і фармакалогіі. Д-р філасофіі (1933). Скончыў Вашынгтонскі ун-т (1928). З 1928 у Гарвардскай мед. школе, з 1942 у н.-д. лабараторыі Велкам (Нью-Йорк). Навук. працы па хіміі пірымідзінавых сістэм, антаганістаў пурыну і пірымідзіну, антыметабалітаў нуклеінавых к-т, хіміятэрапіі пухлін, стварэнні антыбактэрыяльных і імунадэпрэсантных прэпаратаў. Нобелеўская прэмія 1988 (з Дж. *Блэкам* і Г.*Элаян*). *В.Ф.Ермакоў.*

ХІТЫНАЗО́І (Chitinozoa), група выкапнёвых жывёльных арганізмаў, якія адносіліся да прасцейшых. Жылі ў морах. На Беларусі рэшткі Х. выяўлены ў адкладах ардовіку, сілуру, ніжняга дэвону. Па рэштках Х. вызначаюць узрост геал. адкладаў.

Ракавіны трывалыя, хіцінападобныя, цыліндрычнай або канічнай формы, 1-, 2- і 3-слойнай будовы, з гладкай або арнаментаванай паверхняй. Адзіночныя формы, утваралі таксама ланцугападобныя нагрувашчванні.

ХІХО́Н (Gijón), горад на Пн Іспаніі, у аўт. вобл. Астурыя. 259 тыс. ж. (1991). Порт па вывазе вугалю на Біскайскім заліве. Прам-сць: чорная металургія, суднабудаванне, сілікатна-керамічная, рыбакансервавая, тэкстыльная. Рыбалоўства.

ХІЦІ́Н (ад грэч. chitōn адзенне, скура, абалонка), прыроднае злучэнне з групы *поліцукрыдаў*; асноўны кампанент вонкавага шкілета (*кутыкулы*) членістаногіх і інш. беспазваночных, кампанент клетачнай сценкі грыбоў і бактэрый. Выконвае ахоўную і апорную функцыі, забяспечвае трываласць клетак. Паводле будовы, фіз.-хім. уласцівасцей і біял. ролі аналагічны *цэлюлозе* раслін.

ХІ́ЧКАК (Hitchcock) Алфрэд (13.8.1899, Лондан — 29.4.1980), англа-амерыканскі кінарэжысёр, прадзюсер. Скончыў каталіцкі каледж і інж. вучылішча. З 1920 працаваў у кіно як мастак, з 1922 як сцэнарыст і рэжысёр. Вядомасць прынесла серыя дэтэктыўных фільмаў, насычаных «чорным гумарам» і адметных наватарскімі прыёмамі для стварэння напружанай злавеснай атмасферы страху і іроніі: «Шантаж» (1929), «Чалавек, які вельмі многа ведаў» (1934), «39 крокаў» (1935), «Лэдзі знікае» (1938) і інш. З 1939 у Галівудзе, стварыў фільмы «Рэбека» (1940), «Падазрэнне» (1941), «Галавакружэнне» (1958), «Псіхоз» (1960), «Марні» (1964), «Шаленства» (1971) і інш., у якіх падкрэсленасць паталагічных учынкаў, фрэйдысцкія матывы.

Літ.: Трюффо Ф. Кинематограф по Хичкоку: Пер. с англ. М., 1996.

ХІЯ́ЗМ [ад грэч. chiasmos размяшчэнне чаго-небудзь у выглядзе грэч. літары Х (хі)], від сінтаксічнага *паралелізму*, пры якім члены другой часткі складанага сказа (у паэзіі — другой часткі фразы, звычайна ў 2-м паэт. радку) стаяць у адваротным парадку; адна са *стылістычных фігур*. Выкарыстоўваецца для ўзмацнення выразнасці маст. апісання: «...служыла салдатам сасна — для труны, // для крыжа — бяроза» (А.Куляшоў); «Па нівах тваіх, па тваіх гаях // сынава сэрца рыдае» (П.Панчанка). Спецыфічным выразным сродкам з'яўляецца Х., дзе адно са слоў паўтараецца ў абедзвюх частках фразы: «... страціў спадчыннае слова — // штосьці страціў у душы абавязкова» (Н.Гілевіч); «Мы жывем і любім так Радзіму, // каб Радзіма палюбіла нас» (С.Грахоўскі). Амаль пастаянным прыёмам з'яўляецца Х. у адмоўным паралелізме, у яго складзе ўжываюцца словы з процілеглым (антанімічным) значэннем: «Я не буду доўга, // зараз жа вярнуся...» (Я.Колас).

Л.А.Антанюк.

ХІ́ЯС (Chios), востраў у Эгейскім м., каля берагоў п-ва М. Азія, тэр. Грэцыі. Пл. 830 км^2. Паверхня гарыстая, выш. да 1297 м. Складзены пераважна з вапнякоў і сланцаў. Міжземнаморскія хмызнякі, гаі з алепскай хвоі. Плантацыі цытрусавых, вінаграднікі, масліны. Рыбалоўства, козагадоўля, вінаробства. Радовішчы руд сурмы. Адзін з цэнтраў эгейскай культуры. Помнікі стараж.-грэч. і сярэдневяковай архітэктуры. Гал. горад і порт — Хіяс.

ХЛА́ДНІ ФІГУ́РЫ, фігуры, якія ўтвараюцца скопішчам дробных часцінак (напр., сухога пяску) паблізу вузлавых ліній на паверхні вагальнай пласцінкі ці інш. механічнай сістэмы. Адкрыты ням. вучоным Э.Ф.Ф.Хладні (1787).

Кожнаму ўласнаму ваганню (*стаячай хвалі*) пласцінкі адпавядае сваё размяшчэнне вузлавых ліній. У выпадку круглай пласцінкі вузлавыя лініі бываюць кругавымі ці радыяльнымі; у выпадку прамавугольнай ці трохвугольнай пласцінкі яны накіраваны паралельна старанам ці дыяганалям. Пры змене пункту замацавання і месца ўзбуджэння можна атрымаць разнастайныя Х.ф. Выкарыстоўваюцца ў дэфектаскапіі (тапаграфічны метад) для даследавання мех. якасцей вырабу ў цэлым (напр., пласцінкі ці абалонкі).



Хладні фігуры ў выпадку круглай (1) і прамавугольнай (2) пласцінак.

ХЛАДО́НЫ, ф р э о н ы, тэхнічная назва насычаных фторзмяшчальных вуглеводародаў (некат. змяшчаюць таксама атамы хлору ці брому), якія выкарыстоўваюцца як *холадагенты* ў халадзільных агрэгатах і інш.

Газападобныя ці вадкія рэчывы. Добра растваральнікі; некат. ўтвараюць крышталегідраты. Негаручыя, выбуховабяспечныя, хімічна інертныя. Пры ультрафіялетавым апрамяненні ў прысутнасці атамарнага кіслароду разбураюцца з утварэннем радыкалаў, якія дыспрапарцыянуюць да

фторкарбанільных злучэнняў, галагенаў і інш.; хлорзмяшчальныя Х. вылучаюць атамарны хлор, які ўзаемадзейнічае з атм. азонам. Атрымліваюць фтарыраваннем хлор- ці бромпарафінаў фторам, фтарыдамі металаў і інш. Выкарыстоўваюць як прапеленты для аэразоляў, пораўтваральнікі ў вытв-сці пенапластаў, інертныя растваральнікі і інш. У сувязі з уплывам на стратасферны азон прамысл. вытв-сць некат. Х. забаронена ці абмежавана. Малатаксічныя. ГДК 1000—3000 мг/м³.

ХЛАМІДАМО́НАС (Chlamydomonas), род зялёных водарасцей сям. хламідаманадавых. Больш за 500 відаў. Пашыраны ў марскіх і прэсных вадаёмах (часцей забруджаных, са стаячай вадой), у глебе, на наземных субстратах. На Беларусі 18 відаў Х.: Акімавай (Ch.akimovii), глеягамны (Ch.gloeogama), слізісты (Ch.gelatinosa) і інш.

Мікраскапічныя аднаклетачныя рухомыя арганізмы з 2 жгуцікамі і гладкай абалонкай без вырастаў. Плаваюць свабодна або прымацоўваюцца да водных беспазваночных жывёл. Хларапласты чашападобныя, пласціністыя, зорчатыя, з 1—2 пірэноідамі і вочкам. Бясполае размнажэнне дзяленнем на 2—8 зааспор, палавы працэс — гала-, іза-, гетэрагамія, радзей аагамія. Выкарыстоўваюць у ачышчальных збудаваннях, культывуюць у лабараторыях для даследаванняў па генетыцы фотасінтэзу, біялогіі развіцця, вызначэння таксічнасці забруджаных вод. *Т.М.Міхеева.*

ХЛАМІДАСПО́РЫ, споры галаўнёвых і некат. інш. грыбоў, што ўтвараюцца вегетатыўна пры распадзенні міцэлію на асобныя клеткі або інш. шляхам. Утвараюцца пры неспрыяльных умовах.

Маюць разнастайную форму, укрыты тоўстай абалонкай. Бываюць адзіночныя або ў ланцужку. Прарастаюць вегетатыўна міцэлієм, у галаўнёвых грыбоў (*тэліяспоры*) — фрагмабазідыяй.

ХЛАМІДЫЁЗЫ, інфекцыйныя хваробы чалавека і жывёл, якія выклікаюцца *хламідыямі*. Узбуджальнік Х. у чалавека — Chlamydia trachomatis выклікае *трахому* і інш. хваробы вачэй, пахавы *лімфагрануламатоз*, урагенітальныя Х. і інш. Заражэнне: палавым шляхам, кантактнае (напр., пры пераносе хламідый, якія ўтрымліваюцца ў выдзяленнях вачэй хворага на Х.). Нованароджаныя заражаюцца ад хворай маці пры праходжанні па родавых шляхах. Пры кантакце з хворымі птушкамі чалавеку перадаецца *арнітоз*. Да Х. жывёл адносяцца хламідыёзныя аборты авечак і буйн. раг. жывёлы, бронхапнеўманія цялят, Х. свіней і інш.

ХЛАМІ́ДЫІ (Chlamydia), род мікраарганізмаў сям. хламідыевых; унутрыклетачныя паразіты млекакормячых жывёл, птушак і чалавека. Выклікаюць *хламідыёзы*. 2 віды: Ch.trachomatis і Ch.psittaci.

Нерухомыя кокападобныя мікраарганізмы, утвараюць мікракаланіі, укрытыя агульнай мембранай. Цыкл развіцця ўключае 2 розныя па марфалогіі і біял. уласцівасцях формы існавання. Элементарнае цельца (стадыя спакою) — інфекцыйная форма. Унутры пашкоджаных клетак гаспадара яно павялічваецца і ператвараецца ў ініцыяльнае цельца (вегетатыўная стадыя Х.), якое дзеліцца драбленнем. Цыкл развіцця заканчваецца, калі даччыныя клеткі перабудоўваюцца, ушчыльняюцца і ператвараюцца ў элементарныя цельцы, якія выжываюць па-за клеткай і могуць заражаць інш. клеткі гаспадара. Спор і капсул не ўтвараюць. Растуць, размнажаюцца і выспяваюць за 40 гадз. Па-за арганізмам гаспадара Х. гінуць праз 1 мін пры т-ры 90—100 °С.

«ХЛАПАМА́НІЯ», «хлапаманства» (ад польскага chłop селянін, мужык), саркастычная назва цікавасці асобных прадстаўнікоў сац. эліты (найперш шляхты) Беларусі і Украіны да нар. мовы і культуры ў 19 — пач. 20 ст. Найб. пашырана ў 1850—60-я г. Тэрмін «Х.» спачатку з'явіўся ў польскамоўным перыяд. друку, адкуль запазычаны і рус. друкам. На Беларусі «Х.» выявілася ў вывучэнні мовы і фальклору, дэманстратыўным з'яўленні шляхты ў вясковым асяроддзі ў сял. вопратцы і ўжыванні бел. мовы, складанні на ёй лістоў да сялян і літургічных спеваў. Паводле сведчання ўдзельніка бел. «Х.» В.*Савіч-Заблоцкага*, ёю захапіліся каля 50 чал. (пераважна графы, князі, дзеці генералаў і камергераў), у іх ліку былі і каталікі, і праваслаўныя. У 1868—70 у Пецярбургу дзейнічала асветніцкая арг-цыя бел. «хлапаманаў» «*Крывіцкі вязок*» (разагнана ўладамі). У 1910—я г. «Х.» лічылася фін. і маральная падтрымка бел. нац. руху з боку М.І.*Радзівіл*. На Украіне «хлапаманы» (У.Б.*Антановіч*, Ф.Р.Рыльскі, П.І.Жыцецкі і інш.) стварылі ў пач. 1860-х г. свае гурткі (грамады) у Кіеве, Чарнігаве, Палтаве, Харкаве і інш., але ў сувязі з урадавымі рэпрэсіямі ў 1863 спынілі дзейнасць. Сац. з'явы, аналагічныя «Х.», — тыповыя для працэсу фарміравання нацый сярод народаў Цэнтр. і Усх. Еўропы, напр., у венграў, чэхаў, славенцаў і інш.

Кр.: Суспільно-політичний рух на Україні в 1863—1864 рр.: [Матеріали і док.]. Київ, 1964; Савіч-Заблоцкі В. Пісьмы да М.П.Драгаманава // Беларуская літаратура XIX ст.: Хрэстаматыя. Мн., 1988.

П.У.Церашковіч.

ХЛАПІ́ЦКІ Юзаф Гжэгаж (14.3.1771, с. Капусціна на Валыні — 30.9.1854), дыктатар у час *паўстання 1830—31*, генерал дывізіі (1815). У 1785—93 служыў у польскай і рас. арміях. Удзельнічаў у *паўстанні 1794*. Пасля яго падаўлення эмігрыраваў, служыў у польскіх легіёнах напалеонаўскай арміі, ваяваў у Іспаніі ў 1808—12, атрымаў званне генерала брыгады. Удзельнік *вайны 1812* на баку Францыі, паранены выйшаў у адстаўку. У 1815 Аляксандр I прызначыў Х. камандзірам 1-й пях. дывізіі войска *Каралеўства Польскага*; з 1818 у адстаўцы. Быў праціўнікам акцый, накіраваных супраць Расіі. У час паўстання 1830—31, калі быў прызначаны яго дыктатарам, даў магчымасць намесніку Канстанціну Паўлавічу з войскам пакінуць каралеўства, стрымліваў ваен. падрыхтоўку, не падтрымаў прапанову Д.Хлапоўскага пра адпраўку войск на Беларусь і Літву. Толькі ў канцы снеж. 1830 — пач. 1831 аддаў загад аб арганізацыі батальёнаў рухомай гвардыі, згадзіўся на павелічэнне арміі да 100 тыс. пяхоты і 20 тыс. кавалерыі. Х. імкнуўся заключыць дагавор з Мікалаем I на ўмовах прызнання польскай канстытуцыі і пашырэння яе дзейнасці на Беларусь. У Грохаўскай бітве 25.2.1831 паранены. Жыў у Кракаве, у грамадска-паліт. падзеях не ўдзельнічаў. *В.В.Швед.*

ХЛАРАВА́ННЕ АРГАНІ́ЧНЫХ ЗЛУЧЭ́ННЯЎ, увядзенне ў малекулу арган. злучэнняў атама *хлору*. Для хларавання выкарыстоўваюць свабодны хлор Cl_2 і хлорысты вадарод HCl, хлорысты сульфурыл $SOCl_2$ і інш. Далучэнне хлору да кратных сувязей ацыклічных, аліцыклічных або гетэрацыклічных злучэнняў адбываецца і па радыкальным, і па іонным механізме, напр.: $CH_2{=}CH_2{+}Cl_2 \rightarrow$ $\rightarrow ClCH_2CH_2Cl$. Выкарыстоўваюць для прамысл. атрымання алілхларыду, дыхлорэтану і інш.

ХЛАРАВА́ННЕ ВАДЫ́, апрацоўка вады хлорам і яго злучэннямі з мэтай яе абеззаражвання, абясколервання і абежалезвання. Метад засн. на здольнасці свабоднага хлору і яго злучэнняў прыгнечваць ферментныя сістэмы мікраарганізмаў, якія каталізуюць акісляльна-аднаўленчыя рэакцыі. Выкарыстоўваюць вадкі і газападобны хлор, гіпахларыты, аксіды хлору. Праводзяць Х.в. ў спец. апаратах — хларатарах.

ХЛАРАПЛА́СТЫ (ад грэч. chlōros зялёны + plastos вылеплены), унутрыклетачныя арганоіды (*пластыды*) раслін, у якіх адбываецца *фотасінтэз*. З-за наяўнасці *хларафілу* афарбаваны ў зялёны колер. Знаходзяцца ў клетках розных тканак надземных органаў раслін, асабліва ў лісці і зялёных пладах. У вышэйшых раслін Х. лінзападобнай формы, адасоблены ад цытаплазмы знешняй мембранай (абалонкай). Унутры знаходзяцца структурныя адзінкі — тылакоіды, у якіх лакалізаваны пігменты: асноўныя — хларафілы, дапаможныя — *караціноіды*. Маюць рыбасомы, ДНК, ферменты. Акрамя фотасінтэзу ў іх адбываецца сінтэз АТФ, сінтэз і гідроліз ліпідаў, крухмалу, бялкоў і ферментаў, што ўдзельнічаюць у светлавой рэакцыі. Уласны генет. апарат і спецыфічная бялоксінтэзавальная сістэма абумоўліваюць адносную аўтаномію Х. ад інш. клетачных структур. Пры старэнні лісця і сцёблаў, выспяванні пладоў хларафіл у Х. разбураецца і ператвараецца ў *храмапласты*.

ХЛАРАПРО́Н, 2-хлорбутадыен-1,3, манамер, сыравіна для атрымання *хларапрэнавых каўчукоў*, $CH_2{=}C(Cl)CH{=}CH_2$.

Бясколерная вадкасць з рэзкім пахам, $t_{пл}$ 130 °С, $t_{кіп}$ 59,4 °С, шчыльн. 958 кг/м³ (20 °С). Не раствараецца ў вадзе, змешваецца з большасцю арган. растваральнікаў. Атрымліваюць гідрахлараваннем *вінілацэтылену*. Таксічны; ГДК у атм. паветры 0,002 мг/м³.

ХЛАРАПРЭ́НАВЫЯ КАЎЧУКІ́, сінтэтычныя каўчукі, палімеры *хларапрэну* агульнай формулы [-$CH_2C(Cl)$-$CHCH_2$-]n.

Маюць светла-жоўты колер, мал. м. 100—200 тыс.; шчыльн. 1200—1240 кг/м³. Характарызуюцца высокай клейкасцю, растараюцца ў араматычных і хлараваных вуглевадародах. Вулканізуюцца аксідамі металаў (напр., цынку ZnO, магнію MgO). Гумы з Х.к. масла-, бензо-, азона-, цепла-, зносаўстойлівыя, негаручыя. Прамысл. метад сінтэзу Х.к. — эмульсійная палімерызацыя хларапрэну. Выкарыстоўваюць у выт-сці канвеерных стужак, рамянёў, кляёў, для ізаляцыі правадоў і кабеляў, абкладкі хім. апаратуры. Гл. таксама *Латэксы сінтэтычныя*.

ХЛАРА́ТЫ, солі хларнаватай к-ты $HClO_3$.

Крышталічныя, большасць растараецца ў вадзе і некат. арган. растваральніках. Раскладаюцца пры награванні або ў прысутнасці каталізатараў з выдзяленнем кісларода. Акісляльнікі; з рэчывамі, якія лёгка акісляюцца, утараюць выбуховыя сумесі. Найб. вядомы: берталетава соль (гл. *Калію злучэнні*), Х. натрыю $NaClO_3$ і магнію $Mg(ClO_3)_2$. Выкарыстоўваюцца як акісляльнікі, гербіцыды. Таксічныя.

ХЛАРАФІ́ЛЫ (ад грэч. chlōros зялёны + phyllon ліст), зялёныя пігменты раслін, з дапамогай якіх яны ўлоўліваюць энергію сонечнага святла і ажыццяўляюць *фотасінтэз*. Аснова малекулы Х. — складанае цыклічнае злучэнне — Mg-парфірынавы комплекс. У клетках Х. знаходзяцца ў *хларапластах* і *храматафорах*. Фізіялагічна Х. актыўныя толькі ў звязанай з бялком форме. Існуе некалькі тыпаў Х. (a, b, c, d), якія адрозніваюцца сістэмай спалучаных сувязей і намеснікамі (спектрамі паглынання). У вышэйшых раслін і водарасцях асн. пігментам з'яўляецца Х. a., дадатковымі — Х. b (вышэйшыя расліны, зялёныя водарасці), Х. c. (бурыя і дыятомавыя водарасці), Х. d (чырв. водарасці). Большая ч. малекул Х. паглынае энергію святла (што суправаджаецца ўзбуджэннем малекул Х. — назапашваннем энергіі ўнутры малекул) і перадае яе рэакц. цэнтрам фотасінтэзу (міграцыя энергіі), меншая ч. ўключана ў склад рэакц. цэнтраў і ўдзельнічае ў фотахім. рэакцыях. У рэакц. цэнтры Х. за кошт энергіі кванта, што паглынаецца, адбываецца міжмалекулярны перанос электрона, т.зв. элементарны акісляльна-аднаўленчы акт. У выніку першасных працэсаў фотасінтэзу ўтвараюцца аднаўленыя прадукты (НАД·Н, НАДФ·Н) і АТФ. Энергія, назапашаная ў гэтых злучэннях, выкарыстоўваецца для біяхім. ператварэнняў вугляроду, які ўваходзіць у цыкл Кальвіна. Т.ч., святло, што паглынаецца Х., ператвараецца ў патэнцыяльную хім. энергію арган. прадуктаў фотасінтэзу. У фотатрофных бактэрый у фотасінтэзе ўдзельнічаюць аналагі Х. — бактэрыяхларафілы.

Літ.: Vernon L.P., Seely G.R. The chlorophylls. New York; London, 1966; Белл Л.Н. Энергетика фотосинтезирующей растительной клетки. М., 1980.

ХЛАРАФО́РМ, трыхлорметан, насычаны аліфатычны галагензмяшчальны вуглевадарод, $CHCl_3$.

Бясколерная вадкасць з саладкаватым пахам, $t_{кіп}$ 61,2 °С, шчыльнасць 1488 кг/м³. Не растараецца ў вадзе, добры растваральнік тлушчаў, смол і інш. Атрымліваюць хлараванем метану, узаемадзеяннем хларалю з гідраксідам кальцыю. Выкарыстоўваецца як растваральнік, сыравіна ў выт-сці хладонаў, лек. сродкаў, для інгаляцыйнага наркозу.

ХЛАРАФО́С, трыхларфон, $[CCl_3CH(OH)P(O)(OCH_3)_2]$, фосфарарганічнае злучэнне, *інсектыцыд* і *акарыцыд* кантактнага і сістэмнага дзеяння.

Крышталічны парашок, $t_{пл}$ 83—84 °С. Растараецца ў вадзе, бензоле, хлараформе, бензіне. Выкарыстоўваюць у барацьбе са шкоднікамі с.-г. культур і лесу, быт. насякомымі і эктапаразітамі жывёл. Сярэднетаксічны для жывёл і чалавека. ГДК 0,5 мг/м³.

ХЛАРНАВА́ЦІСТАЯ КІСЛАТА́, слабая аднаасноўная кіслата, HClO.

Няўстойлівая, існуе толькі ў водных растворах, якія пры захоўванні раскладаюцца з выдзяленнем малекул кісларoду. Моцны акісляльнік. Солі — гіпахларыты. Атрымліваюць растварэннем хлору ці аксіду хлору (Cl_2O) у вадзе. Выкарыстоўваюць як дэзінфекцыйны і адбельвальны сродак, для абясшкоджвання сцёкавых вод.

ХЛАРО́З (ад грэч. chlōros бледна-зялёны, зеленавата-жоўты), бледная немач, адна з форм жалезадэфіцытных анемій. Упершыню апісаны ў 17 ст.; названы «Х.» з-за зеленавата-бледнага адцення скуры ў дзяўчат. Адрозніваюць ранні і позні Х. Ранні сустракаецца рэдка (у дзяўчат 15—20 гадоў) і звязаны з палавым выспяваннем. Позні адзначаецца ў жанчын 35—45 гадоў, развіваецца павольна, абвастраецца ў вясенне-асенні перыяд, што звязана з павышэннем узроўню эстрагенаў, якія прыгнечваюць утварэнне эрытрацытаў, затратамі жалеза пры паўторных цяжарнасцях і інш. Прыкметы: павышаная стамляльнасць, сэрцабіцце, шум у вушах, галавакружэнне, санлівасць, скажэнне смаку (спажыванне мелу, гліны і інш.), ломкасць і дэфармацыя (увагнутасць) пазногцяў, парушэнне менструальнага цыкла і інш. Лячэнне тэрапеўтычнае. *І.М.Семяненя.*

ХЛАРО́З РАСЛІ́Н, хвароба, пры якой парушаецца ўтварэнне хларафілу ў лісці і зніжаецца інтэнсіўнасць фотасінтэзу. Прыкметы: заўчаснае пажаўценне лісця і лістапад, карлікавасць, драбналістасць, разетачнасць, засыханне верхавінак раcткаў, скручванне, мазаічнасць і інш. Часцей пашкоджвае пладова-ягадныя і дэкар. культуры. Выклікаецца Х.р. патагеннымі мікраарганізмамі, неспрыяльнымі глебава-клімат. ўмовамі, парушэннямі тэхналогіі вырошчвання культуры. Адрозніваюць спадчынны, інфекц. і неінфекц. Х.р.

Спадчынны Х.р. узнікае як мутацыя, спадчынная прыкмета шматлікіх сартоў і форм дэкар. раслін (пярэстапялёсткавасць цюльпана, стракаталістасць хларафітуму і інш.) і выкарыстоўваецца ў селекцыі. Інфекцыйны Х.р. выклікаюць вірусы, часам фітапатагенныя грыбы. На Беларусі часцей адзначаюцца хлароз маліны (жоўкнуць лісце, пладаножкі і пладаложы; плады дробныя, аднабокія і сухія), хлароз фасолі, мазаіка цукр. буракоў. Пераносчыкі ўзбуджальнікаў — тлі і інш. насякомыя. Неінфекцыйны Х.р. на Беларусі ўзнікае пераважна ў выніку залішняга вапнавання глебы (жалеза ў глебе пераходзіць у недаступны для раслін стан, развіваецца жалезны Х.р.: лісце жаўцее, сохне і ападае, расліны адстаюць у росце, ураджайнасць зніжаецца, плады драбнеюць, сохнуць) і парушэнняў рэжыму мінер. жыўлення. Напр., пры недахопе серы ў кукурузы жаўцеюць ці чырванеюць жылкі і верхняе лісце парасткаў. Пры недахопе цынку ў пладовых дрэў вясной утвараюцца кальчаковыя парасткі з разеткамі дробнага пажоўклага лісця.

ХЛАРЫ́ДЫ НЕАРГАНІ́ЧНЫЯ, злучэнні *хлору* з меншы электраадмоўнымі элементамі. Х.н. адна- і двухвалентных металаў — солі (многія растараюцца ў вадзе); полівалентных металаў і неметалаў — пераважна кавалентныя злучэнні (многія растараюцца ў арган. растваральніках і гідралізуюцца вадой). Х.н. неметалаў — звычайна вадкія або газападобныя злучэнні; некат. з іх — комплексныя злучэнні.

Атрымліваюць з простых рэчываў, узаемадзеяннем салянай к-ты з металамі, аксідамі, гідраксідамі, карбанатамі і гідракарбанатамі. У прыродзе ўтвараюць шматлікія мінералы, напр., *бішафіт*, *галіт*, *карналіт*, *сільвініт*. Знаходзяцца ў марской вадзе, саляных падземных расолах. Выкарыстоўваюцца ў выт-сці хлору, шчолачаў, некат. металаў і інш. Гл. таксама *Галагеніды*.

ХЛАРЫ́Н, гл. ў арт. *Полівінілхларыдныя валокны*.

ХЛАРЫ́ТЫ, 1) солі хлорыстай к-ты $HClO_2$.

Бясколерныя або жаўтаватыя крышталі, добра растараюцца ў вадзе (за выключэннем Х. серабра і свінцу); у цвёрдым стане пры награванні і ўдары ўзрываюцца. У кіслым асяроддзі — моцныя акісляльнікі. У прам-сці Х. натрыю выкарыстоўваюць для адбельвання тканін. Пры пападанні ў арганізм чалавека дзейнічаюць на кроў. Таксічная доза для чалавека да 1 г на 1 кг масы цела. 2) Х. — група мінералаў, у асн. алюмасілікатаў магнію, алюмінію, жалеза (напр., карундафіліт, амезіт, шамазіт). Уваходзяць у састаў многіх горных парод.

ХЛАРЭ́ЛА (Chlorella), род зялёных водарасцей сям. хларэлавых. Больш за 50 відаў (дакладна ідэнтыфікавана каля 10). Пашыраны ў прэсных і салёных вадаёмах, у глебе, на камянях, дрэвах; у сімбіёзе з *гідрабіёнтамі* ўтвараюць т.зв. зоахларэлы; *фікабіёнт* лішайнікаў. На Беларусі 5 відаў Х.: букавая (Ch.faginea), звычайная (Ch.vulgaris), эліпсоідная (Ch. ellipsoidea) і інш.

Мікраскапічныя адзіночныя, шарападобныя, з гладкай абалонкай клеткі. Хларапласт прысценны, суцэльны, рассечаны або лопасцевы, з пірэноідам ці без яго. Пры размнажэнні ў клетках утвараецца 4—8 (16) аўтаспор. Выкарыстоўваюць для біял. ачысткі сцёкавых вод, рэгенерацыі паветра ў замкнутых прасторах (касм. караблі, падводныя лодкі), вывучэння працэсаў фотасінтэзу; культывуюць на корм рыбе і жывёле. *Т.М.Міхеева.*

ХЛАРЭНХІ́МА (ад *хларафіл* + грэч. enchyma налітае, тут — тканка), парэнхімная тканка раслін, клеткі якой маюць фотасінтэзавальныя структуры — *хларапласты* і здзяйсняюць *фотасінтэз*. Для Х. характэрна развітая сістэма паветраносных поласцей, з якіх у клеткі паступае вуглякіслы газ, неабходны для фотасінтэзу, а з іх выдзяляецца кісларод. Шматлікія хларапласты ў Х. размяшчаюцца ўздоўж сценак клеткі для макс. доступу вуглякіслага газу звонку. Высокаспецыялізаваная Х. — мякаць (мезафіл) ліста. Утвараецца таксама ў маладых сцёблах, органах кветкі, пладах і паветраных каранях.

ХЛЕБ, харчовы прадукт, які вырабляецца выпяканнем разрыхленага дражджамі ці закваскай цеста. Асн. сыравіна ў вытв-сці Х. — мука, вада, соль, дрожджы. Пры вырабе палепшаных і здобных гатункаў выкарыстоўваюць цукар, патаку, малако, яйцы, тлушчы, солад, разынкі, мак, спецыі і інш. Для дыетычных гатункаў Х. выкарыстоўваюць вотруб'е, цэлае і драблёнае зерне, марскую капусту, карацін, вітамінныя, бялковыя, мінер. і інш. дабаўкі. Х. мае вугляводаў (пераважна крухмал) 40—45%, бялкоў 5—10%, вітаміны групы В, мінер. рэчывы, цукар, тлушчы. Энергет. каштоўнасць 100 г аржанога Х. 190 ккал, пшанічнага — 226 ккал.

На Беларусі вырабляюць простыя гатункі Х. («Беларускі»), палепшаныя («Водар», «Вясковы», «Майскі», «Мінскі», «Пятроўскі», «Сітны», «Сталовы»), заварныя («Барадзінскі», «Броварскі», «Дымкаўскі», «Крынічны», «Нарачанскі», «Суражскі», «Траецкі», «Юбілярны»), дыетычныя («Асілак», «Асоль», «Водар вітамінізаваны», «Зярнятка», «Панацэя», «Пуліхаўскі») і інш.

ХЛЕБАПЯКА́РНАЯ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, галіна *харчовай прамысловасці*, якая спецыялізуецца на вытв-сці *хлеба* і хлебабулачных вырабаў. Для Х.п. характэрны высокая транспартабельнасць асн. сыравіны — *мукі* і нізкая — гатовай прадукцыі (малыя тэрміны захоўвання), у выніку — залежнасць ад штодзённых заказаў гандл. арг-цый. Выкарыстоўваецца мясц. і прывазная сыравіна (мука, спецыі, разынкі).

На Беларусі першы механізаваны з-д пабудаваны ў 1927 у Мінску. На 2001 у Х.п. больш за 160 прадпрыемстваў; найб. буйныя — у Мінску (6 хлебазаводаў і «Аўтамат») і абл. цэнтрах. Невял. заводы і пякарні размешчаны паўсюдна ў населеных пунктах — месцах спажывання іх прадукцыі. Хлеб выпякаюць і на інш. прадпрыемствах харч. прам-сці (напр., Аршанскі мясакансервавы камбінат, Падсвільскі з-д харч. прадуктаў, Баранавіцкая птушкафабрыка і інш.). Вырабляецца больш за 200 найменняў хлеба (жытні, пшанічны, жытнё-пшанічны, палепшаны, заварны, фармавы, подавы), батоны, сушкі, сухары, абаранкі, караваі і інш. Вытв-сць хлеба і хлебабулачных вырабаў 769 тыс. т (2001). *П.І.Рогач.*



Асобная клетка і размнажэнне **хларэлы** звычайнай.

ХЛЕ́БНАЕ ДРЭ́ВА, віды роду Artocarpus сям. тутавых, што культывуюць у тропіках дзеля ядомых суплоддзяў. Са старажытных часоў на а-вах Малайскага архіпелага і Акіяніі вырошчваюць Х.д. звычайнае, або брэдфрут (A.altilis), у Паўд.-Усх. Азіі — Х.д. джэк, ці джэкфрут (A.heterophyllus), з масай суплоддзяў 20—30 кг.

Аднадомныя дрэвы выш. 30—35 м. Лісце суцэльнае або лопасцевае. Дробныя аднаполыя кветкі сабраны ў суквецце з мясістай воссю, у тканку якой яны поўнасцю паглыблены. Пасля апладнення вось разрастаецца і ўтварае буйныя, масай 2—4 (30) кг, ядомыя суплоддзі, у вонкавым слоі якіх размешчаны ўласна плады — касцянкі з семем даўж. 2—3 см. Найб. каштоўныя безнасенныя (партэнакарпічныя) формы Х.д. Харч. расліны.

ХЛЕ́БНІКАЎ Велімір (Віктар Уладзіміравіч; 9.11.1885, с. Малыя Дэрбеты, Калмыкія — 28.6.1922), рускі пісьменнік; тэарэтык *футурызму*. Вучыўся ў Казанскім (з 1903) і Пецярбургскім (1908—11) ун-тах. Друкаваўся з 1908. З 1910 кіраўнік літ. групы «будзетлян» (рус. назва футурыстаў, належыць Х.), пасля — кубафутурыстаў. Удзельнік футурыстычных зб-каў «Садок суддзяў» (1909—13), «Аплявуха грамадскаму густу» (1913), «Рыкаючы Парнас» (1914). Рэфарматар паэт. мовы (эксперыменты ў галіне словатворчасці, *мудрагельства*, стварэнне «зорнай» мовы). Яго паэзіі ўласцівы філас. праблематыка, жанравыя наваўтварэнні, рыфматворчасць, шматгалоссе рытмаў. Аўтар пацыфісцкай паэмы пра 1-ю сусв. вайну «Вайна ў пастцы» (1919), рэв. паэм «Ладамір» (1920), «Ноч перад Саветамі» (1921), «звышаповесцей» «Драпіна па небе» (1920), «Зангезі» (1922), цыкла гіст.-матэм. арт. «Дошкі лёсу» (1922), прысвечаных прыродзе часу, апавяданняў, драм. Паўплываў на рус. і еўрап. авангард, у т.л. ў музыцы і жывапісе.

Тв.: Стихотворения. Поэмы. Драмы. Проза. М., 1986; Творения. М., 1986.

Літ.: Степанов Н. Велимир Хлебников: Жизнь и творчество. М., 1975; Григорьев В.П. Грамматика идиостиля: В.Хлебников. М., 1983; Ленквист Б. Мироздание в слове: Поэтика Велимира Хлебникова: Пер. с англ. СПб., 1999; Мир Велимира Хлебникова: Статьи. Исслед., 1911—1998. М., 2000. *А.В.Спрынчан.*

ХЛЕ́БНЫ КАМА́РЫК, насякомае, гл. *Гесенская муха*.

Галінка **хлебнага дрэва** звычайнага.

ХЛЕЎ, гаспадарчая пабудова для ўтрымання свойскай жывёлы. Вядомы са старажытнасці ў большасці народаў свету, у славян з 5 ст. да н.э. На Беларусі вядомы ў 9 ст. як лёгкае збудаванне тыпу паветкі. У залежнасці ад жывёлы, якую трымаюць у Х., наз. аўчарня, кароўнік, свінарнік, цялятнік і інш. У некат. мясцовасцях (Паазер'е, Падняпроўе, Пн Цэнтр. Беларусі) вядомы і рэгіянальныя назвы Х. (напр., *абора*). У сял. сядзібе Х. ставяць асобна ад інш. пабудоў або ў комплексе з імі. Найчасцей гэта драўляная пабудова зрубнай ці зрубна-слупавой канструкцыі з 2- або 4-схільным дахам. Унутр. загародкі з лёгкіх жэрдак дзеляць Х. на ч. для рознай жывёлы. У калект. і фермерскіх

Хлявы: уверсе — з галубятняй, на Палессі; унізе — у вёсцы Шані Пружанскага раёна Брэсцкай вобл. Канец 19 — 1-я пал. 20 ст. Малюнкі.

гаспадарках Х. звычайна прыстасаваны для ўтрымання аднаго віду жывёлы, іх будуюць паводле спец. праектаў з улікам заатэхн. і інж. тэхналогій.

Літ.: Сергачев С.А. Белорусское народное зодчество. Мн., 1992. *С.А.Сергачоў.*

В.Р.Хлопін.

ХЛО́ДВІГ I (Chlodwig; каля 466—27.11.511), кароль салічаскіх *франкаў* з 481 (пазней — усяго Франкскага каралеўства). З дынастыі *Меравінгаў*. У 486 пашырыў уладанні салічаскіх франкаў да р. Луара, што стала зыходным этапам стварэння *Франкскай дзяржавы*. Заваяваў большасць зямель *алеманаў* (496), выгнаў з Паўд. Галіі *вестготаў* (507), падпарадкаваў франкаў, што жылі па сярэднім цячэнні Рэйна. Умацаваў каралеўскую ўладу. У 496 прыняў хрысціянства ў артадаксальнай форме (інш. герм. плямёны прытрымліваліся *арыянства*), што спрыяла ўмацаванню яго ўлады, забяспечвала яму падтрымку духавенства і добразычлівыя адносіны гала-рымскага насельніцтва. Сваёй рэзідэнцыяй зрабіў Парыж. Пры Х. запісана *Салічаская праўда*.

ХЛО́ПІН Віталь Рыгоравіч (26.1.1890, г. Перм, Расія — 10.7.1950), расійскі радыехімік; адзін з заснавальнікаў рас. радыехіміі і радыевай прам-сці. Акад. АН СССР (1939; чл.-кар. 1933). Герой Сац. Працы (1949). Скончыў Гётынгенскі (1911) і Пецярбургскі (1912) ун-ты. У 1915—21 у Радыелагічнай лабараторыі, з 1922 у Радыевым ін-це АН СССР (з 1939 дырэктар). Навук. працы па радыехіміі, тэхналогіі радыеактыўных рэчываў, вызначэнні геал. ўзросту Зямлі. Атрымаў першыя ў Расіі прэпараты радыю, арганізаваў даследаванні па хіміі і геахіміі радыеактыўных элементаў. Адкрыў закон размеркавання мікракампанента паміж цвёрдымі і вадкімі фазамі (закон Х.). Арганізатар прамысл. здабычы радыю і гелію ў СССР. Дзярж. прэміі СССР 1943, 1946, 1949.

Тв.: Избр. труды. Т. 1—2. М.; Л., 1957.

ХЛО́ПІН Мікалай Рыгоравіч (28.7.1897, г. Тарту, Эстонія — 21.6.1961), расійскі гістолаг; адзін з заснавальнікаў эвалюц. гісталогіі. Акад. АМН СССР (1945). Ген.-маёр мед. службы. Скончыў Ваенна-мед. акадэмію (1921) і ун-т (1922) у Петраградзе. З 1921 працаваў у Ваенна-мед. акадэміі (у 1936—55 нач. кафедры), адначасова ў Анкалагічным ін-це (1928—38), Ін-це эксперым. медыцыны (1932—54), з 1955 у Ін-це анкалогіі АМН СССР. Навук. працы па вывучэнні эпітэліяльных і мышачных тканак. Распрацаваў генет. класіфікацыю тканак пазваночных, тэорыю дывергентнай эвалюцыі тканак. Дзярж. прэмія СССР 1947.

Тв.: Культура тканей. Л., 1940; Гистологические элементы опухолей // Злокачественные опухоли. М.; Л., 1947. Т. 1, ч. 1.

ХЛО́ПЦАВА Алена Іванаўна (н. 21.5.1960, Мінск), бел. спартсменка (веславанне акадэмічнае). Засл. майстар спорту СССР па акад. веславанні (1980), майстар спорту СССР па плаванні (1973). Скончыла Бел. ін-т фіз. культуры (1985). Чэмпіёнка свету сярод юніёраў (1978, Бялград) на двойцы парнай на дыстанцыі 1000 м. Чэмпіёнка XXII Алімп. гульняў (1980, Масква) на двойцы парнай (1000 м), бронз. прызёр XXV Алімп. гульняў (1992, г. Барселона, Іспанія), на чацвёрцы парнай без рулявой (2000 м). Чэмпіёнка свету (1981, г. Мюнхен, Германія; 1982, г. Люцэрн, Швейцарыя; 1983, г. Дуйсбург, Германія) на чацвёрцы парнай з рулявой (1000 м). Сярэбраны прызёр чэмпіянатаў свету (1985, Бельгія; 1990, Аўстралія; 1991, Вена) на чацвёрцы парнай без рулявой (2000 м). Бронз. прызёр чэмпіянату свету (1978, г. Окленд, Новая Зеландыя) на чацвёрцы парнай з рулявой (1000 м). Чэмпіёнка Спартакіяд народаў СССР [1979; 1983, Масква — на чацвёрцы парнай з рулявой (1000 м); 1991, г. Ніжні Ноўгарад, Расія — на двойцы парнай (2000 м) і на чацвёрцы парнай без рулявой (2000 м)], бронз. прызёр (1983, Масква) на двойцы парнай (1000 м). 15-разовая чэмпіёнка СССР (1977—85, 1989—91) на двойцы парнай і на чацвёрцы парнай.

ХЛО́ПЫ (ад польск. chłop селянін, мужык), у Польшчы: 1) асноўная сучасная назва сялян і *сялянства*. 2) У перыяд феадалізму агульная (часта са зневажальным адценнем) назва запрыгоненых сялян. Сац. слой Х. утварыўся да 16 ст. ў выніку зліцця ранейшых катэгорый феад.-залежнага сялянства — аскрыптыцыяў, гаспітаў, серваў-*халопаў* і інш.

ХЛОР (лац. Chlorum), Cl, хімічны элемент VIII групы перыяд. сістэмы, ат.н. 17, ат.м. 35,453, адносіцца да *галагенаў*. Прыродны Х. — сумесь стабільных ізатопаў ^{35}Cl (75,77%) і ^{37}Cl (24,23%). У зямной кары $1{,}7 \cdot 10^{-2}$% па масе. Трапляецца ў выглядзе мінералаў, найважн. — *галіт, бішафіт, сільвініт*. Вял. запасы Х. (у выглядзе хларыд-іона) у Сусв. акіяне, падземных расолах і саляных азёрах. Адзін з біягенных элементаў. Адкрыты ў 1774 швед. хімікам К.Шэеле.

Жоўта-зялёны газ з рэзкім раздражняльным пахам (адсюль назва ад грэч. chloros жоўта-зялёны), $t_{кіп}$ -33,97 °С, шчыльн. 3,214 кг/м³ (25 °С). Раствараецца ў вадзе, чатырохлорыстым вугляродзе, гептане і інш. Малекула двухатамная. Адзін з найб. хімічна актыўных элементаў, моцны акісляльнік. Непасрэдна ўзаемадзейнічае з усімі металамі і большасцю неметалаў (утварае *хларыды*). З кіслародам утварае шэраг аксідаў, найважн. з іх — Х. дыаксід ClO_2, трыаксід Cl_2O_6 і аксід Cl (VII). Атрымліваюць электролізам водных растворaў натрыю хларыду. Выкарыстоўваюць пераважна ў вытв-сці хлорзмяшчальных арган. злучэнняў (напр., *вінілхларыду*), неарган. хларыдаў, а таксама для адбельвання цэлюлозы і тканін, водаачысткі. Таксічны, раздражняе слізістыя абалонкі, дыхальныя шляхі і лёгкія; ГДК у атмасферы 0,03 Мг/м³ (сярэднясутачная).

Літ.: Фрумина Н.С., Лисенко Н.Ф., Чернова М.А. Хлор. М., 1983.

А.П.Чарнякова.

ХЛОРАБАКТЭ́РЫІ, тое, што *зялёныя бактэрыі*.

ХЛОРАМІ́НЫ, хлорвытворныя аміяку і амінаў, у малекулах якіх атам хлору звязаны з азотам.

Вадкія ці цвёрдыя рэчывы з рэзкім пахам. Моцныя акісляльнікі і хларавальныя агенты. Пры дзеянні вільгаці раскладаюцца да амінаў і хларнаваціставай к-ты. Растворы Х. ў арган. растваральніках (бензоле, дыэтылавым эфіры) устойлівыя пры захоўванні ў цемнаце. Неарган. Х. атрымліваюць узаемадзеяннем хлору ці гіпахларытаў з аміякам у водным растворы; арган. Х. — дзеяннем хлору ці хларнаваціставай к-ты на аміны і іх солі. Выкарыстоўваюць Х. (хларамін Б, дыхларамін ХБ, пантацыд) як сродак адбельвання, хлараванння, дэзінфекцыі і дэгазацыі.

ХЛОРАРГІРЫ́Т (ад *хлор* + грэч. argyros серабро), кераргірыт, мінерал класа галагенідаў, хларыд *серабра*, AgCl. Змяшчае 73,3% серабра, 24,7% хлору, прымесі ёду, ртуці. Утварае бесперапынны ізаморфны рад з *бромаргірытам*.

Крышталізуецца ў кубічнай сінганіі. Утварае зярністыя агрэгаты, шчоткі з дробных крышталёў, кубічныя крышталі і інш. Колер жамчужна-шэры з жоўта-зялёным ці бурым адценнямі, на свежым зломе бясколерны, пад уплывам святла — фіялетава-карычневы да чорнага. Цв. 2,5. Шчыльн. 5,5—5,6 г/см³. Пластычны. Паходжанне гіпергеннае. Трапляецца ў зонах акіслення радовішчаў серабразмяшчальных сульфідных руд. Утварае другасныя *сярэбраныя руды*.

ХЛОРБЕНЗО́Л, фенілхларыд, араматычны галагензмяшчальны вуглевадарод, C_6H_5Cl.

Бясколерная вадкасць з характэрным пахам, $t_{пл}$ -45,58 °С, $t_{кіп}$ 131,7 °С. Добра растваральніках, з вадой утварае азеатропную сумесь. Мае ўласцівасці араматычных злучэнняў. Атрымліваюць каталітычным хлараваннем бензолу. Выкарыстоўваюць у вытв-сці фенолу, дыхлорбензолаў, фарбавальнікаў, некат. пестыцыдаў і інш. Таксічны, выклікае галаўны боль, галавакружэнне, санлівасць, расстройствы страваванння, пры траплянні на скуру — экзэму. ГДК у паветры рабочай зоны 2 мг/м³, у вадзе вадаёмаў гасп.-быт. прызначэння 0,02 мг/л.

ХЛОРВО́ЦАТНЫЯ КІСЛО́ТЫ, галагенкарбонавыя кіслоты; хлорзамешчаныя вытворныя *воцатнай кіслаты*. Адрозніваюць мона- ($ClCH_2COOH$), ды- ($Cl_2CHCOOH$) і трыхлорвоцатную (Cl_3CCOOH) к-ты. Найб. выкарыстоў-

ваюць монахлорвоцатную, ці хлорвоцатную к-ту.

Хлорвоцатная к-та — бясколерныя гіраскапічныя крышталі, $t_{пл}$ 62,3 °С. Растваральніцца ў вадзе, ацэтоне, бензоле. У прам-сці атрымліваюць хлараванием воцатнай к-ты і кіслотнай гідратацыяй трыхлорэтылену. Выкарыстоўваюць у вытв-сці *карбаксіметылцэлюлозы, камплексонаў*, фарбавальнікаў (напр., *індыга* атрымліваюць узаемадзеяннем Х.к. з аніліну), гербіцыдаў. Атрутная, раздражняе вочы, дыхальныя шляхі, скуру; ГДК 1 мг/м^3.

А.П.Чарнякова.

ХЛО́РНАЯ ВАДА́, раствор хлору ў вадзе. Хлор у Х.в. часткова гідралізуецца і ўтвараецца хларнаваціста к-та, якая раскладаецца на святле на атамарны кісларод і саляную к-ту. Моцны акісляльнік. Выкарыстоўваецца як сродак дэзінфекцыі і адбельвання.

ХЛО́РНАЯ ВА́ПНА, складаны комплекс гіпахларыту і хларыду кальцыю, гашанай вапны і крышталізаванай вады. Мае 28—38% актыўнага хлору і каля 10% вады.

Белы гіраскапічны парашок з пахам хлору. Моцны акісляльнік. Атрымліваюць узаемадзеяннем газападобнага хлору з гашанай вапнай. Пры захоўванні запаволена раскладаецца, страчвае каля 10% актыўнага хлору за год. Выкарыстоўваюць як сродак дэзінфекцыі, дэгазацыі і адбельвання.

ХЛО́РНАЯ КІСЛАТА́, адна з самых моцных неарган. к-т, $HClO_4$.

У свабодным стане бясколерная вадкасць, дыміць на паветры; з часам цямнее і становіцца выбуханебяспечнай. Водныя растворы ўстойлівыя, $t_{пл}$ 102 °С, $t_{кіп}$ 110 °С. Акісляльнік. Солі Х.к. — *перхлараты*. Атрымліваюць узаемадзеяннем перхларатаў з канцэнтраванай сернай к-той і інш. спосабамі. Выкарыстоўваецца пры раскладанні складаных руд, пры аналізе мінералаў, у якасці каталізатара.

ХЛОРСУЛЬФО́НАВАЯ КІСЛАТА́, моцная неарганічная кіслата, $SO_2Cl(OH)$.

Бясколерная вадкасць з рэзкім пахам, дыміць на паветры, $t_{пл}$ 80 °С, $t_{кіп}$ 155 °С. Вельмі рэакцыйназдольная. Бурна рэагуе з вадой (утварае H_2SO_4 і HCl). Выкарыстоўваецца ў вытв-сці некат. фарбавальнікаў, мыйных і лек. сродкаў, сінт. смол і інш.; дымаўтваральны сродак. Ядавітая, выклікае апёкі скуры і цяжкія пашкоджанні дыхальных шляхоў.

ХЛО́РУ ДЫАКСІ́Д, злучэнне *хлору* з кіслародам, ClO_2.

Зеленавата-жоўты газ, у вадкім стане яркачырв., у цвёрдым чырванавата-жоўты; $t_{пл}$ 59,5 °С, $t_{кіп}$ 11 °С. Добра растваральніцца ў вадзе, сернай і воцатнай к-тах, чатыроххлорыстым вугляродзе. Мае каля 26,3% актыўнага хлору (колькасць Cl_2, якая вылучаецца пры ўзаемадзеянні з салянай к-той). Моцны акісляльнік. Атрымліваюць аднаўленнем хларатаў SO_2 шчаўевай або салянай к-тамі. Выкарыстоўваюць для адбельвання тканін, цэлюлозы ў вытв-сці паперы вышэйшых гатункаў; абяшкоджання сцёкавых вод, якія маюць у сабе фенолы; для падрыхтоўкі пітной і тэхнал. вады. Раздражняе дыхальныя шляхі; ГДК у паветры 0,1 мг/м^3.

ХЛОРЦЫЯ́Н, хлорысты цыян, хлорангідрыд цыянавай кіслаты, ClCN.

Бясколерны газ, $t_{пл}$ -6,9 °С, $t_{кіп}$ 12,8 °С. Растваральніцца ўмерана ў вадзе, добра — у арган. растваральніках. Выкарыстоўваецца ў вытв-сці цыянуравай к-ты, яе вытворных, нітрылаў і інш. Ядавітае рэчыва, выклікае агульнае атручэнне, раздражняе слізістыя абалонкі вачэй і верхніх дыхальных шляхоў. Пачатковая раздражняльная канцэнтрацыя Х. ў паветры 0,002 мг/л, лятальная — 0,06 мг/л.

ХЛОРЫСТАВАДАРО́ДНАЯ КІСЛАТА́, тое, што *саляная кіслата*.

ХЛО́РЫСТЫ ВАДАРО́Д, злучэнне *хлору* з вадародам, HCl.

Бясколерны газ з рэзкім пахам, у вільготным паветры моцна дыміць; $t_{пл}$ 114,2 °С, $t_{кіп}$ 85,1 °С. Водны раствор Х.в. — *саляная кіслата*. У прам-сці атрымліваюць сінтэзам з элементаў і як пабочны прадукт пры хлараванні арган. злучэнняў. Выкарыстоўваецца ў вытв-сці салянай к-ты і арган. хлорэмяшчальных рэчываў, у т.л. палімераў. Таксічны, раздражняе скуру і слізістыя абалонкі, разбурае зубы, выклікае катар верхніх дыхальных шляхоў; ГДК у атм. паветры — 0,05 мг/м^3.

ХЛО́РЫСТЫ КА́ЛІЙ (KCl), соль, якая ўтвараецца ў выніку ўзаемадзеяння злучэнняў *калію* з салянай к-той (HCl) або яе солямі.

Белыя крышталі (або крышт. парашок) без паху, салёныя на смак; мал. м. 74,5, т-ра плаўлення 776 °С, шчыльн. 1980 кг/м^3. Растваральніцца ў вадзе, не растваральніцца ў спірце. Выкарыстоўваецца ў сельскай гаспадарцы, медыцыне (уваходзіць у склад лек. прэпаратаў), біял. і хім. даследаваннях, металургіі.

ХЛО́РЫСТЫ СУЛЬФУРЫ́Л, сульфурылхларыд, галагенід *серы*, SO_2Cl_2.

Бясколерная вадкасць з рэзкім пахам; дыміць на паветры; $t_{пл}$ 54 °С, $t_{кіп}$ 69,5 °С. Растваральніцца ў вадзе, воцатнай к-це і інш. Гідралізуецца пры награванні з утварэннем HCl і H_2SO_4. У арган. сінтэзе хларавальны і ацыліравальны агент; растваральнік, каталізатар.

ХЛУП (Chlup) Отакар (31.8.1875, г. Боскавіцы, Чэхія — 14.5.1965), чэшскі педагог. Акадэмік Чэхаславацкай АН (1952), праф. Пражскага ун-та (з 1953). Скончыў Пражскі ун-т і з 1919 выкладаў у ім педагогіку. У 1922—39 праф. ун-та ў г. Брно, дзе заснаваў Т-ва новага выхавання і быў рэдактарам (з 1927) яго часопіса. Па яго ініцыятыве ў 1946 адкрыты пед. ф-ты ва ун-тах Чэхаславакіі. З 1953 праф., арганізатар і заг. кафедры педагогікі ў Пражскім ун-це. Заснавальнік (1957) і дырэктар (да 1960) Ін-та педагогікі Я.А.Каменскага Чэхаславацкай АН. Аўтар прац па праблемах навучання, пед. адукацыі, гісторыі педагогікі, у т.л. падручніка «Педагогіка» (2-е выд. 1965), «Хрэстаматыі па гісторыі педагогікі» (т. 1—2, 1948—50). Адзін з рэдактараў «Педагагічнай энцыклапедыі» (т. 1—3, 1938—40).

Тв.: Рус. пер. — Избр. пед. соч. М., 1966.

Н.К.Мазоўка.

ХЛЫСТЫ́ (скажонае ад «хрысты», саманазва «людзі божыя»), рэлігійная секта. Узнікла ў Расіі ў канцы 17 ст. сярод сялян нечарназёмнай паласы. Заснавальнік кастрамскі селянін Д.Філіповіч. Аснова веравызнання Х. — уяўленне пра магчымасць прамой сувязі чалавека са «святым духам» і ўвасаблення «духа» ў пэўных людзях, якія становяцца для Х. «хрыстамі» і «багародзіцамі». Гал. месца ў ідэалогіі займае пропаведзь аскетызму. Х. не прызнаюць святароў і пакланення святым, адхіляюць свяшчэнныя і царк. кнігі, аднак дапускаюць наведванне правасл. цэркваў. Сходы Х. праходзяць у форме «радзенняў» (малітвы са скокамі). У Расіі ў пач. 20 ст. было каля 40 тыс. Х. У СССР іх колькасць рэзка скараціласа. Невял. абшчыны Х. захаваліся ў Тамбоўскай, Самарскай, Арэнбургскай абл. Расіі, Паўн. Каўказе і на Украіне.

ХЛЮ́СЦІН Іван Мікалаевіч (18.8.1862, Масква — 21.11.1941), расійскі артыст балета, балетмайстар, педагог. Скончыў Маскоўскае тэатр. вучылішча (1878). У 1878—1903 у Вял. т-ры ў Маскве (з 1886 вядучы танцоўшчык, з 1898 балетмайстар), адначасова з 1889 выкладаў у Маскоўскім тэатр. вучылішчы. З 1903 у Парыжы, адкрыў балетную школу. З 1911 балетмайстар і педагог Парыжскай оперы, у 1914—31 (з перапынкамі) балетмайстар-пастаноўшчык у трупе Г.Паўлавай. Сярод партый: Феб («Эсмеральда» Ц.Пуні), Альберт («Жызэль» А.Адана), Дэзірэ («Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага) і інш. Паставіў балеты «Зоркі» А.Сімона (1898), «Чароўны чаравічак» Ю.Гербера (1899), «Русалка» Л.Ламбера (1911), «Танцавальная сюіта» на муз. Ф.Шапэна (1913) і інш.

ХЛЯБЦЭ́ВІЧ Іван Андрэевіч (1857, в. Сядзельнікі Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл. — 25.7.1919), бел. гісторык. Бацька Я.І.*Хлябцэвіча*. Скончыў правасл. Літоўскую духоўную семінарыю ў Вільні, вучыўся ў Пецярбургскай духоўнай акадэміі. Выкладаў у Жыровіцкім духоўным вучылішчы, адначасова загадваў б-кай Жыровіцкага Свята-Успенскага мужчынскага манастыра, дзе ўпарадкаваў стараж. рукапісы. З 1897 святар у в. Кленікі Бельскага пав. У 1-ю сусв. вайну з 1915 у бежанстве у г. Сызрань (Расія). Аўтар публікацый па гісторыі Жыровіцкага манастыра, нарыса пра сына Уладзіміра.

Тв.: Краткий исторический очерк образа Жировичского монастыря (анонимно). [Вильна, б.г.]; Иосафат Жарский, провинциал Литовских базилианских монастырей... Гродно, 1897; Жировичское братство Милосердия Пресвятой Девы Марии. Вильна, 1900.

Літ.: Хлябцэвіч Я. Біяграфія бацькі, НББ 091/159 // Białoruskie zeszyty historyczne. 1996. № 1(5).

В.У.Скалабан.

ХЛЯБЦЭ́ВІЧ Яўген Іванавіч (6.8.1884, в. Жыровічы Слонімскага р-на Гродзенскай вобл. — 20.10.1953), бел. і расійскі бібліятэказнавец, бібліёграф, літ.-знавец. Сын І.А.*Хлябцэвіча*. Канд. пед. н. (1947). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1913). Друкаваўся ў газ. «Наша доля» і «Наша ніва» (пад псеўд. Халімон з-пад

пушчы); супрацоўнічаў у пецярбургскай газ. «Новая Русь». Удзельнік 2-га з'езда Бел. сацыяліст. грамады (1906). Адзін з арганізатараў гуртка па вывучэнні Гродзенскай губ., *Беларускага навукова-літаратурнага гуртка* ў Пецярбургу. У 1919 інструктар Бел. пададдзела асветы нац. меншасцей Нар. камісарыята асветы РСФСР у Кіеве, потым у Маскве. З 1919 заг. бібліятэчнага аддзялення паліт. ўпраўлення Рэўваенсавета рэспублікі, з 1930 працаваў у Наркамасвеце РСФСР, з 1943 выкладчык, вучоны сакратар Маскоўскага бібліятэчнага ін-та. Удзельнічаў у стварэнні на Беларусі бясплатных нар. паўленкаўскіх бібліятэк. Даследаваў пытанні кіравання чытаннем, праблему «пісьменнік і чытач», перапісваўся з бел. і рус. пісьменнікамі. Аўтар прац «Бібліятэкі і кааперацыя» (1912), «Адраджэнне беларускай народніцкай літаратуры» (1914, перавыд. ў 1917 пад назвай «Народніцкая паэзія беларусаў»), артыкулаў і ўспамінаў пра Ф.Багушэвіча, Я.Баршчэўскага, А.Бурбіса, Я.Купалу, Цётку.

Літ.: Леончиков В. Е.И.Хлебцевич — видный советский библиотековед и библиограф // Вопросы библиографоведения и библиотековедения. Мн., 1976; Скалабан В. Купала и Хлебцевич // Неман. 1985. № 3.

В.У.Скалабан.

ХМА́РЫ, шляхецкі род герба «Крыўда» ў ВКЛ. Найб. вядомыя:

Антоній, скарбнік мінскі ў пач. 18 ст. Адам Міхал Станіслаў (22.12.1720—9.6.1805), сын Антонія, мінскі лоўчы з 1748, падчашы з 1756, сакратар малой пячаткі ВКЛ у 1760—65, інстыгатар ВКЛ у 1765—79, мінскі кашталян у 1779—84 і ваявода з 1784; чл. Пастаяннай Рады з 1783. У 1761—82 некалькі разоў выбіраўся паслом на соймы, быў маршалкам Трыбунала ВКЛ у 1785. Ад падканцлера ВКЛ М.Сапегі за службу ў якасці яго падскарбія (1743—52) і сакратара ў 1755 атрымаў маёнтак Сёмкаў Саламярэцкі (цяпер в. Сёмкава) каля Мінска. Вызначаўся ўмелым гаспадараннем, надрукаваў працу па кіраванні маёнткам — «Інструкцыя для аканома». Да 1780 пабудаваў палац, дзе меліся б-ка, архіў, збраёўня. Яўхім, сын Антонія, мінскі падчашы і пісар гродскі з 1765, падстолі з 1772, стольнік з 1780, войскі з 1789. Меў сына Гіпаліта, маршалка мінскага, на сынах якога Яўхіме (?—1868) і Адаме (?—1888) род згас.

У.М.Вяроўкін-Шэлюта.

ХМЕ́ЛЕВА, вёска ў Жабінкаўскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 11 км на ПнЗ ад горада і чыг. ст. Жабінка, 24 км ад Брэста. 368 ж., 163 двары (2003). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — *Хмелеўская Праабражэнская царква.*

ХМЕ́ЛЕЎСКАЯ ПРААБРАЖЭ́НСКАЯ ЦАРКВА́, помнік драўлянага дойлідства ў в. Хмелева Жабінкаўскага р-на Брэсцкай вобл. Пабудавана ў 1725 на могілках. У архітэктуры спалучаюцца рысы барока з элементамі класіцызму. У 19 ст. перароблены тамбур, зменены верх, побач з храмам пастаўлена драўляная каркасная 2-ярусная званіца. Царква ў плане крыжовая, з 5-граннай апсідай і 2 рызніцамі. Да гал. зах. фасада, які ўтварае бабінец, прыбудаваны тамбур з шырокай лесвіцай. У дэкоры выкарыстаны масіўныя руставаныя лапаткі па вуглах і на гал. фасадзе. Над сяродкрыжжам фігурная шмат'ярусная галоўка. Пры царкве дзейнічае мужч. пустынь.

Т.І.Чарняўская.

Хмелеўская Праабражэнская царква.

ХМЕЛЬ (Humulus), род кветкавых раслін сям. каноплевых. 4 віды. Пашыраны ва ўмераным поясе Паўн. паўшар'я. На Беларусі 1 від — Х. звычайны (H.lupulus). Трапляецца па вільготных лясах, хмызняках, берагах рэк.

Адна- і шматгадовыя двухдомныя травяністыя расліны. Сцёблы даўж. да 10 м, павойныя, рабрыстыя, полыя, на зіму адміраюць. Лісце супрацьлеглае, акруглае, лопасцевае. Кветкі дробныя, аднаполыя, мужчынскія — у мяцёлчатых, жаночыя — у коласападобных суквецці. Прыкветкі жаночага суквецця пасля цвіцення разрастаюцца і ўтвараюць суплоддзі — «шышкі». Плод — арэшак.

«Шышкі» Х. звычайнага маюць да 22% смалістых рэчываў (лупулін), выкарыстоўваюцца ў піваварнай прам-сці, замест дражджэй пры хлебапячэнні, як антысептык у медыцыне. Сцёблы маюць грубае валакно, ідуць на корм жывёле. Тэхн., дэкар., эфіраалейныя, лек., валакністыя, прыпраўныя расліны.

ХМЕЛЯВО́ДСТВА, галіна раслінаводства па вырошчванні *хмелю*. Суквецці (шышкі) хмелю маюць эфірны алей, горкія і дубільныя рэчывы і выкарыстоўваюцца ў вытв-сці *піва*, дражджэй, лек. прэпаратаў, касметычных сродкаў, лакаў, фарбаў. Сцябло прыдатнае для вытв-сці грубага валакна.

Узнікла ў 10 ст. Пашырана ў Германіі (32% пл. сусв. пасеваў), ЗША (24%), Чэхіі (10%), Кітаі (8%), Японіі, Украіне, Расіі і інш. У 1999 пл. хмельнікаў складала больш за 57 тыс. га, у т.л. ў Еўропе 64%. Вылучаюць 4 групы гатункаў хмелю: А — найлепшы араматычны; В — араматычны; С — які не мае значэння ў піваварэнні; Д — горкі. На сусв. рынку найб. каштоўныя араматычныя гатункі хмелю.

На Беларусі Х. развіта слаба. Вырошчваюць 5 замежных гатункаў, якія мала прыстасаваны да мясц. умоў. Плошча пладаносных хмельнікаў 50 га. Найб. гаспадарка — бел.-ням. прадпрыемства «Бізон» у Маларыцкім р-не Брэсцкай вобл. На патрэбы піваварнай прам-сці хмель імпартуюць пераважна з Чувашыі, дзе сканцэнтравана асн. прамысл. вытв-сць хмелю ў Расіі (2,5—3 тыс. т штогод).

Т.Л.Казакова.

ХМЕЛЯГРА́Б (Ostrya), род кветкавых раслін сям. бярозавых. 5—7 (паводле інш. звестак 10) відаў. Пашыраны ў Еўразіі, Паўн. і Цэнтр. Амерыцы. На Беларусі інтрадукаваны Х. віргінскі (O.virginiana) і звычайны (O.carpinifolia).

Хмель звычайны.

Галінка **хмелятраба** звычайнага.

Лістападныя аднадомныя дрэвы выш. 10—25 м або кусты. Лісце чаргаванае. Тычынкавыя (мужчынскія) кветкі ў суквецці каташок, шышкападобныя жаночыя каташкі (з песцікавых кветак) падобныя на жаночыя суквецці хмелю (адсюль назва). Плод — арэшак. Драўніну Х. звычайнага выкарыстоўваюць на дробныя вырабы, кару — для дублення скур і атрымання фарбы. Дэкар., тэхн. расліны.

ХМУ́РЫЧ Уладзімір Львовіч (н. 1.12.1957, г. Альмецьеўск, Расія), бел. танцоўшчык. Засл. арт. Беларусі (1992). Скончыў Варашылаўградскае культ.-асв. вучылішча (1975). З 1978 артыст балета ансамбляў песні і танца Паўд. групы войск (Венгрыя), з 1983 Бел. ваен. акругі, з 1988 Паўн. групы войск (Польшча), у 1992—2000 Узбр. Сіл Рэспублікі Беларусь. Выконваў сола ў многіх харэаграфічных пастаноўках («Брэсцкая крэпасць», «Беларуская рапсодыя», «Вяселле ў Малінаўцы», «Кадрыль» і інш.).

ХМЫЛЬ Аляксандр Аляксандравіч (н. 10.3.1942, г. Бабруй Варонежскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне тэхналогіі мікра- і радыёэлектронікі. Д-р тэхн. н. (2001), праф. (1992). Скончыў Мінскі радыётэхн. ін-т (1964). З 1965 на Мінскім прыборабуд. з-дзе. З 1967 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі (з 1995 дэкан ф-та, з 2000 прарэктар). Навук. працы па тэхналогіі вытв-сці вырабаў электроннай тэхнікі. Распрацаваў метады атрымання матэрыялаў мікраэлектронікі з зададзенымі ўласцівасцямі, прынцыпы пабудовы праграмна-кіравальнага абсталявання, высокаэфектыўныя рэсурсазберагальныя тэхнал. працэсы. Аўтар падручнікаў для ВНУ. Дзярж. прэмія Беларусі 1996.

Тв.: Технология и автоматизация производства радиоэлектронной аппаратуры. М., 1989 (у сааўт.); Технология производства ЭВМ. Мн., 1994 (разам з А.П.Дастанкам, М.І.Пікулем); Технология и техника прецизионного лазерного модифицирования твердотельных структур. Мн., 2002 (у сааўт.).

ХМЯЛЁЎСКІ Аркадзь Сільвестравіч (3.2.1921, в. Асеёўка Мінскага р-на — 17.2.1987), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў Мінскі юрыд. тэхнікум, Тамбоўскае ваен. пях. вучылішча (1942), Ленінградскую вышэйшую бранятанк. школу (1946). У Вял. Айч. вайну з 1942 на Зах., Бранскім, Цэнтр., 1-м Укр. франтах. Удзельнік Курскай бітвы, вызвалення Украіны, Польшчы, Чэхаславакіі. Стралк. батальёна на чале з капітанам Х. вызначыўся ў студз. 1945 пры прарыве абароны праціўніка, захопе некалькіх нас. пунктаў на тэр. Польшчы. Пасля вайны ў нар. гаспадарцы.

ХМЯЛЁЎСКІ Канстанцін Іосіфавіч (1905, Мінск — вясна 1943), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў *Мінскага патрыятычнага падполля* ў Вял. Айч. вайну. Да вайны на гасп. рабоце. У час акупацыі Мінска з вер. 1941 удзельнічаў у арганізацыі падполля, разам з М.К.*Каржанеўскім* кіраваў падп. групай у Кастр. р-не горада, накіроўваў дзейнасць камсамольска-маладзёжных груп. З мая 1942 сакратар падп. Кастр. райкома КП(б)Б, з чэрв. чл. Мінскага гаркома КП(б)Б, заг. аддзела па арганізацыі дыверсій, удзельнічаў у распаўсюджванні падп. газ. *«Звязда»* і лістовак. У кастр. 1942 арыштаваны і вясной 1943 загублены ў фаш. катавальнях.

ХМЯЛЁЎСКІ Мікалай Рыгоравіч (1.10.1900, в. Бароўка Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. — 13.9.1980), генерал-лейтэнант авіяцыі (1949). Скончыў Ваенна-паветр. акадэмію імя Жукоўскага (1936). У Чырв. Арміі з сак. 1918. Удзельнік грамадз. вайны 1918—20, баёў на Усх. і Ферганскім франтах. З 1923 на паліт. рабоце ў Чырв. Арміі і грамадз. паветр. флоце. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Зах. і Бранскім франтах. Удзельнік баёў пад Масквой, Усх.-Прускай, Усх.-Памеранскай, Берлінскай аперацый. Пасля вайны да 1960 у цэнтр. апараце ВПС СССР.

А.С.Хмялеўскі.

М.П.Хмялёў.

ХМЯЛЁВА Ніна Мікалаеўна (28.2.1932, С.-Пецярбург — 30.4.2000), бел. вучоны ў галіне гідраэкалогіі і заалогіі. Д-р біял. н. (1986), праф. (1990). Скончыла Ленінградскі ун-т (1955). З 1955 у Заалагічным ін-це Рас. АН. З 1962 у Ін-це біялогіі паўд. мораў Укр. АН (г. Севастопаль). З 1971 у Ін-це заалогіі Нац. АН Беларусі (заг. лабараторыі). Навук. працы па праблемах экалагічнай біяэнергетыкі водных беспазваночных жывёл, эколага-энергет. асаблівасцях размнажэння ракападобных, колькасных заканамернасцях генератыўнага і экзувіяльнага росту водных беспазваночных.

Тв.: Продукция кормовых и промысловых ракообразных. Мн., 1984 (разам з А.П.Голубевым); Закономерности размножения ракообразных. Мн., 1988; Экология пресноводных креветок. Мн., 1997 (у сааўт.). *А.В.Аляхновіч.*

ХМЯЛЁЎ Іван Іванавіч (1919, г. Стары Аскол Белгародскай вобл., Расія — 21.2.1944), удзельнік вызвалення Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў курсы мал. лейтэнантаў (1942). На фронце з 1941. Стралк. рота на чале са ст. лейтэнантам Х. вызначылася ў баі каля в. Вішчын Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл., дзе ў выніку атакі вызваліла вёску, стварыла плацдарм для пераправы баявой тэхнікі палка па лёдзе цераз Дняпро. Загінуў у баі. На месцы бою ў в. Вішчын помнік.

ХМЯЛЁЎ Мікалай Паўлавіч (10.8.1901, г. Ніжні Ноўгарад, Расія — 1.11.1945), расійскі акцёр, рэжысёр. Нар. арт. СССР (1937). З 1919 у 2-й Студыі Маскоўскага Маст. т-ра, з 1924 у Маскоўскім Маст. акад. т-ры (у 1943—45 маст. кіраўнік). У 1932 арганізаваў Тэатр-студыю пад кіраўніцтвам М.Хмялёва, якая ў 1937 увайшла ў склад Маскоўскага т-ра імя М.Ярмолавай (у 1937—45 маст. кіраўнік). Яго акцёрскую манеру вылучалі стрыманасць і строгасць, імкненне да паглыбленага псіхал. аналізу, завершанасці сцэн. формы: Аляксей Турбін («Дні Турбіных» М.Булгакава), Карэнін («Ганна Карэніна» паводле Л.Талстога), Тузенбах («Тры сястры» А.Чэхава) і інш. Паставіў спектаклі «Не было ні гроша, ды раптам шастак» А.Астроўскага (1934, з Л.Целяшовай), «Як вам гэта спадабаецца» У.Шэкспіра (1940), «Дзеці сонца» М.Горкага (1944, абодва з М.Кнебель). З 1920 здымаўся ў кіно: «Саламандра» (сав.-ням.), «Пакаленне пераможцаў», «Чалавек у футарале» і інш. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1942, 1946.

Літ.: Новицкий П.И. Хмелев. М., 1964.

ХМЯЛЬНІ́К, вёска ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і камунальнага унітарнага с.-г. прадпрыемства. За 59 км на ПнУ ад горада і 56 км ад чыг. ст. Гарадок, 98 км ад Віцебска. 358 ж., 178 двароў (2002). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

ХМЯЛЬНІ́К, бальнеалагічны курорт на Украіне, на беразе р. Паўд. Буг, за 65 км ад г. Вінніца. Клімат умерана кантынент., асн. лек. фактары — вуглякіслыя гідракарбанатна-кальцыева-магніевыя з высокай колькасцю радону і гідракарбанатна-кальцыева-натрыевыя мінер. воды (на ванны). Лечаць хваробы сардэчна-сасудзістай, нерв. і апорна-рухальнай сістэм, гінекалагічныя і скурныя захворванні.

ХМЯЛЬНІ́ЦКАЯ ВО́БЛАСЦЬ. Размешчана на ПдЗ Украіны. Утворана 22.9.1937. Да 1954 наз. Камянец-Падольская вобл. Пл. 20,6 тыс. км^2. Нас. 1441,6 тыс. чал. (2001), гарадскога 45%. Цэнтр — г. *Хмяльніцкі*. Найб. гарады: Камянец-Падольскі, Шапятоўка, Славута.

Паверхня — спадзістахвалістая раўніна, парэзаная далінамі рэк, ярамі. Займае цэнтр. ч. Падольскага ўзв. (выш. да 396 м), на Пн — ч. Валынскага ўзвышша. Карысныя выкапні: торф, гаручыя сланцы, буд. матэрыялы (каалін, гліны, вапнякі, мел, гіпс, граніты). Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. -5,6 °С, ліп. 19,4 °С. Ападкаў 550—600 мм за год. Гал. рэкі: Днестр, Паўд. Буг, вярхоўі Гарыні і Случы (бас. р. Прыпяць). Глебы дзярнова-падзолістыя, чарназёмныя (на Пн), шэрыя і светла-шэрыя ападзоленыя (на Пд). Большая частка Х.в. размешчана ў лесастэпавай зоне. Пад лесам каля 13%, пераважна на Пн (хваёвыя лясы з дамешкамі бярозы і асіны), на Пд у далінах рэк і на водападзелах — невял. масівы з дуба, граба, клёна, ліпы, бука.

Асн. галіны прам-сці — харч. (цукр., мясная, малочная, сыраробная, алей-

ная, агароднінакансервавая, спіртавая, піваварная, кандытарская, мукамольна-крупяная), камбікормавая, машынабудаванне і металаапрацоўка (вытв-сць абсталявання кавальска-прэсавага, для харч. прам-сці, трансфарматарных падстанцый, электрапрылад, кабелю, трактарных агрэгатаў, дрэварэзальных інструментаў, радыётэхнікі), лёгкая (тэкст., швейная, трыкат., гарбарна-абутковая), дрэваапр., у т.л. мэблевая і цэлюлозна-папяровая, шкляная, фарфора-фаянсавая. Хмяльніцкая АЭС. Вытв-сць буд. матэрыялаў. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на вытв-сці збожжа, цукр. буракоў і мяса-малочнай жывёлагадоўлі.



Від на горад **Хмяльніцкі**.



Пад с.-г. ўгоддзямі 1,5 млн. га. Пасяўныя пл. займаюць 1,1 млн. га (2000). Асн. збожжавыя культуры — азімая пшаніца, ячмень, зернебабовыя, кукуруза; таксама авёс, проса, грэчка; з тэхн. — цукр. буракі, сланечнік, рапс, тытунь, хмель, цыкорый, каляндра; з кармавых — караняплоды, канюшына, люцэрна. Бульбаводства, агародніцтва. Садоўніцтва. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней, авечак і коз. Развіты птушкагадоўля, рыбаводства, пчалярства. Даўж. чыгунак 732 км, аўтадарог з цвёрдым пакрыццём 7 тыс. км. Асн. чыгунка Кіеў—Львоў, аўтадарогі Кіеў—Вінніца—Хмяльніцкі—Львоў, Хмяльніцкі—Камянец-Падольскі—Чарнаўцы. Суднаходства па р. Днестр. Газаправоды «Саюз», Кіеў—захад Украіны, Урэнгой—Памары—Ужгарад. *Л.В.Лоўчая.*

ХМЯЛЬНІЦКІ, горад, цэнтр Хмяльніцкай вобл. на Украіне, на р. Паўд. Буг. Вядомы з 1493, да 1954 наз. Праскураў. Перайменаваны ў гонар Б.*Хмяльніцага*. 262 тыс. ж. (2001). Чыг. вузел. Прам-сць: машынабудаванне (вытв-сць кавальска-прэсавага абсталявання, тэрмапластаўтаматаў, трансфарматарных падстанцый, радыётэхнікі, трактарных агрэгатаў), харч. (масласыраробная, мясная), лёгкая (абутковая, швейная, трыкат.), хім., дрэваапр. (мэблевая); вытв-сць буд. матэрыялаў. Тэхнал. ін-т быт. абслугоўвання. Краязнаўчы музей. 2 тэатры.

ХМЯЛЬНІЦКІ Аляксандр Ільіч (н. 10.6.1954, г. Смалявічы Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне біяфізікі. Канд. фіз.-матэм. н. (1985), дац. (1988). Скончыў БДУ (1976). З 1976 у НДІ прыкладных фіз. праблем БДУ, з 1986 у БДУ (з 1989 заг. лабараторыі). Навук. працы па вывучэнні біясенсараў, спектраскапіі біяструктур, праводнасці двухслойных ліпідных мембран, мембраннай біяфізіцы. Дзярж. прэмія Беларусі 2000.

Тв.: Одиночные ионные каналы и макроскопическая проводимость бислойных липидных мембран (у сааўт.) // Биофизика. 1989. Т. 34, № 1; Биофизические механизмы функционального отклика клеток (у сааўт.) // Выбр. навук. працы БДУ. Мн., 2001. Т. 7. Біялогія. Геаграфія. *А.Б.Самаль.*

ХМЯЛЬНІЦКІ Багдан (Зіновій) Міхайлавіч (каля 1595, верагодна, г. Чыгірын Чаркаскай вобл., Украіна — 6.8.1657), гетман Украіны (з 1648), дзярж. дзеяч, палкаводзец. Паходзіў з дробнай правасл. шляхты. Адукацыю атрымаў у езуіцкім калегіуме ў Львове. Удзельнічаў у паходах супраць туркаў і крымскіх татар, у казацкіх паўстаннях. У рэестравым казацкім войску быў вайсковым пісарам, пасля паўстання 1637—38 чыгірынскі сотнік. У 1647 арыштаваны за падрыхтоўку новага паўстання супраць Польшчы. Пасля вызвалення ўцёк у Запарожскую Сеч, дзе выбраны гетманам запарожскага войска. У 1648 заключыў саюз з крымскім ханам супраць Польшчы і пачаў баявыя дзеянні. У маі 1648 у бітвах на Жоўтых Водах і каля Корсуня разбіў польскае войска, пасля чаго на Украіне пачалася вызв. вайна (гл. *Вызваленчая вайна ўкраінскага і беларускага народаў 1648—54*). Напачатку быў прыхільнікам аўтаноміі Украіны ў складзе Каралеўства Польскага, што было замацавана *Зборaўскім дагаворам 1649*. Па ініцыятыве Х. *Пераяслаўская рада*

Б.М.Хмяльніцкі.

1654 зацвердзіла пагадненне з рас. царом Аляксеем Міхайлавічам пра ўваходжанне Украіны ў склад Расійскага царства як аўтаномнай дзяржавы. Аднак у 1656 выявіліся супярэчнасці паміж Х. і царскім урадам, які не прытрымліваўся пагаднення аб аўтаноміі Украіны. Х. пачаў перагаворы са Швецыяй і Малдовай з мэтай замацаваць сваё становішча і забяспечыць сваім сынам пераемнасць улады на пасадзе гетмана. Падтрымліваў кантакты з кіраўніком кальвінісцкай групоўкі ў ВКЛ Б.*Радзівілам*, якому выдаў універсал на недатыкальнасць Слуцка і Слуцкага княства ад дзеянняў казацкіх атрадаў. У гісторыю Х. ўвайшоў як дзярж. дзеяч, які садзейнічаў адраджэнню ў сярэдзіне 17 ст. Украінскай дзяржавы. Ацэнка яго дзейнасці сярод укр. гісторыкаў неадназначная.

Літ.: Документы Богдана Хмельницкого, 1648—1657. Киев, 1961; Крип'якевич І.П. Богдан Хмельницький. 2 вид. Львів, 1990; Смолій В.А., Степанков В.С. Богдан Хмельницький: Соціально-політич. портрет. Київ, 1993; Іх ж а. Богдан Хмельницький: Хроніка життя та діяльності. Київ, 1994; Доба Богдана Хмельницького: (До 400-річчя від дня народження великого гетьмана). Київ, 1995. *А.П.Грыцкевіч.*

ХМЯЛЬНІЦКІ Цімафей (Цімох) Багданавіч (каля 1632—25.9.1653), удзельнік *вызваленчай вайны ўкраінскага і беларускага народаў 1648—54*. Сын Б.*Хмяльніцкага*. Вясною 1648 быў пакінуты заложнікам у крымскага хана, з якім Б.Хмяльніцкі вёў перагаворы пра заключэнне саюза супраць Польшчы. З 1648 чыгірынскі сотнік, удзельнічаў у шматлікіх паходах і бітвах (пад Піляўцамі, Зборавам, Берасцечкам, Батагом); у 1650 — у паходзе ў Малдавію з мэтай разарваць яе саюз з Польшчай. У 1652, вясною і летам 1653 узначальваў паходы ў Малдавію. Загінуў у час аблогі валошскімі, венг. і польскімі войскамі занятага ім г. Сучава (Румынія).

ХНА, хена (араб.), чырвона-жоўтая фарба, якую атрымліваюць з лісця лаўсоніі (расце ў краінах трапічнага пояса). Выкарыстоўваюць для афарбоўкі ў чыр-

вона-буры, стойкі да святла колер тканін (шэрсці, шоўку), валасоў і ногцяў, некат. харч. прадуктаў. Часам Х. наз. расліну, з якой яе атрымліваюць — лаўсонію некалючую.

ХНУМ, у старажытнаегіпецкай рэлігіі і міфалогіі бог урадлівасці і абарончай вайны, падавец вады і захавальнік вытокаў р. Ніл. У грэка-рым. перыяд (з канца 4 ст. да н.э.) бог-дэміург, які на ганчарным крузе стварыў з гліны ўвесь свет. Старажытныя выявы паказвалі яго ў выглядзе барана з закругленымі гарызантальнымі рагамі, пазней — чалавека з галавой барана.

ХО́БАРТ (Hobart), горад у Аўстраліі, на в-ве Тасманія. Адм. ц. штата Тасманія. Засн. ў 1804. 184 тыс. ж. (1990). Порт на беразе зал. Сторм Ціхага ак., у вусці р. Дэруэнт. Трансп. вузел. Прам-сць: каляровая металургія, аўтамабіле- і суднабудаванне, цэментавая, тэкст., харчовая. Ун-т.

ХО́БАТ, выцягнутая рухомая частка морды з адкрытымі на яе канцы ноздрамі ў некат. паўзуноў (мяккія чарапахі) і млекакормячых (большасць насякомаедных, тапіры, самцы марскога слана, сланы і інш.). Звычайна выконвае дыхальную, нюхальную і датыкальную функцыі. У сланоў Х. утвораны ад зрастання выцягнутага носа з верхняй губой.

ХО́БАТАЎ Леанід Васілевіч (н. 23.3.1950, г. Рэчыца Гомельскай вобл.), бел. жывапісец. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1981). З 2000 заг. аддзела, з 2003 дырэктар Рэсп. маст. галерэі. Працуе ў галіне манум.-дэкар. і станковага жывапісу. Аўтар маст. вырашэння станцыі метро «Няміга» (1987), размалёвак «Купалле» для рэстарана «Папарацькветка» ў г. Маладзечна (1983), Дома шлюбу Цэнтральнага р-на Мінска (1989). Гал. формаўтваральныя кампаненты пластычна багатых жывапісных кампазіцый — колер і рытм: «Фамільная чаша», «Вершнік», «Патаемныя сустрэчы», «Доўгі шлях» (усе 1989), «Расставанне» (1990), «Выкраданне Еўропы», «Прыкметы ночы» (абедзве 1991), «Купальшчыцы», «Ва ўвесь голас» (абедзве 1992), «У палоне ў дзеў», «Сустрэча», «Лёс», «Чаканне», «Знак» (усе 1993), «Паданне», «Скрозь вякі», «Прыма», «Пачатак» (усе 1994), «Раўнадзенства» (1997), «Фуга ў чырвоным», «Трыумф белага», «Плынь» (усе 1998), «Праекцыя 7 частак», «Абуджэнне», «Праламленне» (усе 1999), «Марына» (2000), «Агонь» (2002) і інш. *Л.Ф.Салавей.*

ХО́БЕМА, Гобема (Hobbema) Мейндэрт (хрышчаны 31.10.1638, Амстэрдам — 7.12.1709), галандскі жывапісец-пейзажыст. Прадаўжальнік традыцый і, магчыма, вучань *Я.Ройсдала*. Творам уласцівы тонкая назіральнасць прыродных матываў і з'яў, дынамічнасць кампазіцыйнай пабудовы, багатая адценнямі свежая зеленавата-карычневая каларыстычная гама: «Дарога ў лесе» (1663), «Алея ў Мідэлхарнісе» (1689), «Лес», «Вадзяны млын».

М.Хобема. Вадзяны млын.

ХО́БІ (англ. hobby літар. — канёк), захапленне чым-н., любімы занятак у волны час.

ХО́БНАЕ, вёска ў Калінкавіцкім р-не Гомельскай вобл., на аўтадарозе Вял. Аўцюкі—Вял. Бор. Цэнтр сельсавета і унітарнага прадпрыемства. За 38 км на ПдУ ад г. Калінкавічы, 100 км ад Гомеля, 15 км ад чыг. ст. Маканавічы. 395 ж., 180 двароў (2003). Лясніцтва. Сярэдняя школа-сад, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

Л.Хобатаў. Марына. 2000.

ХО́БСАН, Гобсан (Hobson) Джон Аткінсан (6.7.1858, г. Дэрбі, Вялікабрытанія — 1.4.1940), англійскі эканаміст. Скончыў каледж Лінкальна ў Оксфардзе (1878). З 1887 выкладаў у Оксфардзе і Лонданскім ун-це. З 1897 займаўся публіцыстыкай, выступаў з крытыкай капіталізму канца 19 — пач. 20 ст. і афіц. англ. паліт. эканоміі той эпохі (*Кембрыджская школа*). Прапанаваў праграму сац. рэформ, якая прадугледжвала ўстанаўленне мінімуму заработнай платы і высокіх прагрэс. падаткаў на прадпрымальнікаў, жорсткі дзярж. кантроль над манаполіямі. Эканам. спады тлумачыў недаспажываннем і лічыў, што ад нестабільнасці і крызісаў развітыя краіны можа выратаваць толькі экспарт лішняга капіталу ў менш развітыя рэгіёны. Прапаноўваў вярнуцца да класічнай мадэлі капіталізму, заганы якога, на яго думку, можна выкараніць з дапамогай парламенцкай дэмакратыі. Асн. працы: «Імперыялізм» (1902), «Індустрыяльная сістэма» (1904), «Праца і багацце» (1914). *Н.К.Мазоўка.*

ХО́ВАРД (Howard) Джон Уінстан (н. 26.7.1939, г. Сідней, Аўстралія), дзяржаўны і паліт. дзеяч Аўстраліі. Скончыў Сіднейскі ун-т. Юрыст. З 1974 дэпутат аўстрал. парламента ад Ліберальнай партыі, у 1985—89, з 1996 лідэр партыі. У 1975—77 міністр па справах бізнесу і спажывання, у 1977—83 — фінансаў у аўстрал. урадзе. З сак. 1996 прэм'ер-міністр Аўстраліі.

ХО́ГАРТ (Hogarth) Уільям (10.11.1697, Лондан — 25.10.1764), англійскі мастак і тэарэтык мастацтва. Вучыўся ў гравёра Э.Геймбла, з 1720 у акадэміі Дж.Торнхіла ў Лондане. У творах, якія вылучаюцца жывой непасрэднасцю, з пазіцый асветніцтва выявіў заганы тагачаснага

англ. грамадства: серыі «Кар'ера прастытуткі» (1730—31), «Кар'ера мота» (1732—35), «Модны шлюб» (1743—45), «Выбары» (каля 1754). Выканаў партрэты, якім уласцівы жыццесцвярджальнасць і рэалістычнасць: «Капітан Т.Корэм» (1740), «Аўтапартрэт» (1745), «Дзяўчына з крэветкамі». Аўтар тэарэт. трактата «Аналіз прыгажосці» (1753).

Тв.: Рус. пер. — Анализ красоты. 2 изд. Л.; М., 1987.

Літ.: Герман М.Ю. У.Хогарт и его время. Л., 1977.

ХО́ДАСАВІЦКАЕ СВЯЦІ́ЛІШЧА, язычніцкі культавы помнік 10 — пач. 11 ст. каля в. Ходасавічы Рагачоўскага р-на, на беразе воз. Святое, на ўсх. ускраіне стараж. селішча (гл. *Ходасавічы*). Цэнтр. частку свяцілішча складала гарыз. круглая ў плане пляцоўка дыям. 7 м, абкружаная канаўкай шыр. 40 см, глыб. 40—50 см, у якой, напэўна, стаяў вастракол. У цэнтры круга выяўлена паглыбленне дыям. 1 м, глыб. 0,15 м, у якім стаяў драўляны слуп-ідал. З 4 бакоў на адлегласці да 2 м ад краю пляцоўкі знаходзіліся серпападобныя ямы даўж. да 6 м, шыр. 1,8 м, глыб. да 1 м, арыентаваныя па старанах свету. У час язычніцкіх рытуалаў у іх запальвалі вогнішчы. Паўзямлянка на селішчы, верагодна, была жытлом жраца. Даследчыкі лічаць, што Х.с. было прысвечана *Перуну*. *Л.У.Дучыц.*

ХО́ДАСАВІЧЫ, група археал. помнікаў (неалітычнае паселішча, курганныя могільнікі, селішча ранняга сярэдневякоўя) каля в. Ходасавічы Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. Паселішча часоў неаліту (3-е — пач. 2-га тыс. да н.э.) даследавана ў 1959—63. Знойдзены крамянёвыя наканечнікі стрэл, сякеры, разцы, скрабкі, рэшткі грабеньчатага-ямачнай керамікі і інш. На тэр. паселішча размешчаны 2 курганы *сярэднедняпроўскай культуры*. Курганныя могільнікі 8—12 ст. даследаваны ў 1951—69. Пахавальны абрад трупаспаленне і трупапалажэнне. Пры іх даследаванні знойдзены бронзавы наканечнік кап'я, акулярападобныя падвескі, наканечнік стралы, скроневыя кольцы, падвеска-амулет (конік), крыжападобныя і змеегаловападобныя падвескі, шкляныя і золаташкляныя пацеркі, шкляныя і медныя пярсцёнкі, фрагменты керамікі і інш. Селішча даследавана ў 1969. Выяўлены рэшткі 3 прамавугольных у плане паўзямлянак, у 2 жытлах — печы-каменкі, ляпная кераміка 2-й пал. 1-га тыс. н.э. Ва ўсх. частцы селішча размяшчалася *Ходасавіцкае свяцілішча*. *А.Г.Калечыц, А.А.Макушнікаў.*

У.Хогарт. Модны шлюб. 1743—45.

Да арт. Ходасавічы. Гліняная пасудзіна сярэднедняпроўскай культуры.

ХО́ГЕНБЕРГ (Hogenberg) Франц (да 1540, г. Мехелен, Бельгія — 1592), фламандскі гравёр, мастак, картограф. Вучыўся і працаваў у Англіі, Антверпене, супрацоўнічаў з А.Артэліем, гравіраваў карты для 1-га геагр. атласа «Агляд шара зямнога» (1570). З-за рэліг. ўціску ў 1570 уцёк у г. Кёльн. У 1572 разам з кёльнскім тэолагам Г.Браўнам заснаваў шматтомную серыю «Гарады зямнога шара» (апошні, 6-ы том выйшаў у 1618) — збор выяў найважнейшых гарадоў свету, дзякуючы якому зах.-еўрап. чытачы ўпершыню пазнаёміліся з некат. гарадамі ВКЛ, з т.зв. Жыгімонтавым планам Масквы і інш. На картах і планах, створаных Х. ці пад яго рэдакцыяй, Белая Русь выступае як сінонім Маскоўскай дзяржавы.

Літ.: Борисовская Н.А. Старинные гравированные карты и планы XV—XVIII вв. М., 1992; Белы А. Хроніка «Белай Русі»: Нарыс гісторыі адной геагр. назвы. Мн., 2000. *А.В.Белы.*

ХО́ДАРАЎЦЫ, вёска ў Лідскім р-не Гродзенскай вобл., каля р. Лебяда, на скрыжаванні аўтадарог на Жалудок, Беліцу, Радзівонішкі. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 42 км на ПдЗ ад г. Ліда, 87 км ад Гродна, 15 км ад чыг. ст. Скрыбаўцы. 385 ж., 146 двароў (2003). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.



Ходасавіцкае свяцілішча. Рэканструкцыя.

ХО́ДАСЫ, вёска ў Мсціслаўскім р-не Магілёўскай вобл., на аўтадарозе Магілёў—Мсціслаў; чыг. ст. на лініі Орша—Крычаў. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 19 км на ПдЗ ад г. Мсціслаў, 84 км ад Магілёва. 2162 ж., 888 двароў (2003). Камбікормавы з-д, акц. т-вы «Райаграпрамтэхзабеспячэнне», «Райсельгасхімія», «Райпалівазбыт», сепаратарны пункт, аўтазаправачная станцыя. Сярэдняя і муз. школы, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Каля вёскі гарадзішча ранняга жал. веку і эпохі феадалізму.

ХО́ДАШ Аляксандр Аляксандравіч (сапр. Шэпшэль Шэпшэлевіч; 1896, Мінск — ліп. 1951), дзярж. і прафсаюзны дзеяч Беларусі. З сак. 1917 узначальваў прафсаюз дрэваапрацоўшчыкаў у Мінску. У час герм. акупацыі чл. Мінскага падп. райкома РКП(б). У 1918—20 чл. мінскіх губкома партыі і губ. ВРК, К-та абароны Мінска, камісар Асобнага рабочага палка, старшыня Мінскага губ. савета прафсаюзаў, в.а. нар. камісара працы Літ.-Бел. ССР. З 1921 старшыня Савета, з 1924 — Цэнтр. савета прафса-

юзаў Беларусі. З 1925 на прафс. рабоце ў РСФСР. У 1931—37 кіраўнік сектара кадраў, нач. управлення навуч. установ Наркамата фінансаў СССР, з 1939 нам. упраўляючага справамі Наркамата (Мін-ва) земляробства СССР. З 1947 нач. адм.-гасп. аддзела Галоўводгаспадаркі Мін-ва сельскай гаспадаркі СССР. Чл. ЦВК БССР у 1920—25, чл. ЦБ КП(б)Б у 1921—24, ЦК і Бюро ЦК КП(б)Б у 1924—25. У лют.—маі 1924 чл. Часовага бел. Бюро ЦК РКП(б) і канд. у чл. яго Прэзідыума. *Э.Р.Іофе.*

ХО́ДЖА (Hoxha) Энвер (16.10.1908, г. Гіракастра, Албанія — 11.4.1985), дзяржаўны і паліт. дзеяч Албаніі. У 1930—36 вучыўся ва ун-тах г. Манпелье (Францыя) і Брусель. З 1941 чл. кампартыі Албаніі (КПА; з 1948 Албанская партыя працы, АПП), чл. яе ЦК, з 1943 ген. сакратар КПА. У 1942—45 чл. Прэзідыума, старшыня нац.-вызв. фронту Албаніі (са жн. 1945 — Дэмакр. фронт Албаніі, ДФА). У 1944—54 галоўнакамандуючы нац.-вызв. арміяй (з 1945 алб. Нар. армія), адначасова ў 1944—46 узначальваў Часовы дэмакр. ўрад, у 1944—53 міністр нац. абароны. У 1946—54 старшыня Савета міністраў і міністр замежных спраў (1946—53). У 1948—54 ген. сакратар, з ліп. 1954 1-ы сакратар ЦК АПП. Адмовіўся ўхваліць рашэнні XX і XXII з'ездаў КПСС па крытыцы *культу асобы* І.В.Сталіна. Ініцыятар разрыву адносін з СССР (1961) і знешнепаліт. пераарыентацыі краіны на Кітай. Аўтар успамінаў.

Тв.: Рус. пер. — Хрущевцы // Родина. 1990. № 12.

ХО́ДЖКІН (Hodgkin) Алан Лойд (5.2.1914, г. Бэнберы, Вялікабрытанія — 20.12.1998), англійскі вучоны ў галіне фізіялогіі. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1948, у 1970—75 яго прэзідэнт). Чл. Амер. акадэміі мастацтваў і навук, Каралеўскай АН Данії (1964), Нац. АН Індыі, Каралеўскай акадэміі Ірландыі, замежны чл. Рас. АН (1976). Скончыў Кембрыджскі ун-т (1936). З 1939 навук. кансультант Мін-ва ВПС і Мін-ва авіяц. прам-сці, з 1945 у Кембрыджы (1970—81 праф. біяфізікі). З 1971 канцлер Лестэрскага ун-та. У 1978—84 кіраўнік Трыніты-каледжа. Навук. працы па фізіялогіі нерв. клеткі, механізмах узбуджэння і тармажэння. Аўтар асн. тэорый аб ролі іонных градыентаў у генерацыі нерв. імпульсу. Стваральнік сучаснай мембраннай тэорыі ўзнікнення біяэл. патэнцыялаў. Нобелеўская прэмія 1963 (з А.Ф.*Хакслі*, Дж.К.*Эклсам*). *В.Ф.Ермакоў.*

ХО́ДЖКІН Дораці, гл. *Кроўфут-Ходжкін* Дораці.

ХО́ДЗЬКА (Барэйка) Аляксандр (30.8.1804, г.п. Крывічы Мядзельскага р-на Мінскай вобл. — 27.12.1891), паэт, фальклярыст, славіст, усходазнавец. Сын Я.*Ходзькі*, брат І.І.*Ходзькі* і М.*Ходзькі*. Вучыўся ў Віленскай гімназіі, скончыў са ступенню канд. філасофіі Віленскі ун-т (1825), вучэбнае аддзяленне жывых моў пры Азіяцкім дэпартаменце Мін-ва замежных спраў у Пецярбургу (1829). За ўдзел у т-ве *філарэтаў* арыштаваны (1823—24). У час вучобы ў Пецярбургу (1824—31) зблізіўся з А.Міцкевічам, А.Пушкіным, В.Жукоўскім. З 1831 на дыпламат. службе ў Персіі, з 1842 у Парыжы, праф. слав. л-р Калеж дэ Франс (1857—83). Папулярызаваў слав. мовы, фальклор, перакладаў са слав. на ўсх. мовы. Запісваў успаміны Міцкевіча і памагаў яму выдаць іх. Перапісваўся з А.Кіркорам, К. і Я. Тышкевічамі. Першы апісаў эпас пра Гераглы, вершы туркм. паэтаў Махтумкулі, Кеміне, фальклор туркменаў і інш. Выдаў зб. «Паэзія» (1829), у які акрамя балад, засн. на бел. і літ. фальклоры, увайшлі пераклады навагрэч. (пераважна клефтаў) і марлацкіх песень; збор паданняў і песень народаў паўн. Персіі (1842), «Персідскую граматыку» (1852). Напісаў даследаванне па курдскай мове, падрыхтаваў размоўнік па тур. мове, працу пра помнікі стараслав. пісьменства і інш.

Літ.: Грицкевич В.П. Вклад воспитанника Виленского университета Александра Ходзько в развитие востоковедения // Науч. тр. вузов Литовской ССР. История. Вильнюс, 1980. Т. 20, вып. 1; Яго ж. Аляксандр Ходзька (1804—1891) // Славутыя імёны Бацькаўшчыны. Мн., 2000. Вып. 1; Мархель У. Прадвесце. Мн., 1991; Яго ж. Як свечка перад згасаннем // Мархель У.І. Прысутнасць былога. Мн., 1997.

В.П.Грыцкевіч, У.І.Мархель.

ХО́ДЗЬКА Дамінік Цэзары (1800, б. маёнтак Яварова Віленскага пав. — 1863), бел. фальклярыст, этнограф, літаратар. Вучыўся ў Віленскім ун-це. Чл. т-ва *філарэтаў*. Зблізіўся з Я.Чачотам, Т.Занам. Чл. *Віленскай археалагічнай камісіі*. Настаўнічаў у Вільні, на Случчыне. Апублікаваў успаміны і нататкі пра жыццё і дзейнасць К.Брадзінскага (1845), Я.Ходзьку (1858), Л.Бароўскага, Ю.Крашэўскага і інш., урывак са «Збору некаторых успамінаў... да гісторыі Віленскага ун-та. І. Віленская акадэмія ў часы езуітаў» (1862). Збіраў і апрацоўваў бел. вусную нар. творчасць. Аўтар працы пра рэкі Беларусі і Літвы (рукапіс перадаў Віленскай археал. камісіі). Супрацоўнічаў з А.Кіркорам, Я. і К. Тышкевічамі. Распрацаваў біяграфію З.Даленгі-Хадакоўскага і надрукаваў яе ў польскай энцыклапедыі Я.Глюксберга, потым у час. «Athenaeum» («Атэнэум», 1842, т. 1, 4) і «Teka Wileńska» («Віленскі зборнік», 1857, № 2). *Г.А.Каханоўскі.*

А.Л.Ходжкін.

А.Ходзька.

І.І.Ходзька.

ХО́ДЗЬКА Ігнат (29.9.1794, в. Заблошчына Вілейскага р-на Мінскай вобл. — 1.8.1861), пісьменнік, мемуарыст. Канд. філасофіі (1814). Вучыўся ў Віленскім ун-це (1810—14). Чл. т-ва *шубраўцаў* і масонскай ложы ў Мінску. Чл. *Віленскай археалагічнай камісіі* (з 1855). Большую частку жыцця правёў у маёнтку Дзевятня (Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл.). Пісаў на польскай мове. У ранніх апавяданнях («Прыгонны», 1829, і інш.) крытычна ставіўся да існуючых парадкаў, пазней перайшоў на кансерватыўныя пазіцыі. Пісаў вершы («Дамок майго дзядулькі», «Баруны»). Аўтар «Літоўскіх малюнкаў» (1840—62), «Мемуараў скарбніка» (1844), «Літоўскіх паданняў» (1852—60), у якіх апісаў бел. мясціны, жыццё і побыт насельніцтва Беларусі. У сваёй творчасці выкарыстоўваў бел. паданні, песні, жарты, анекдоты. Напісаў псіхал. навелу «Двор на Антокалі» (1850), «Новыя дзённікі скарбніка» (1862, пра старажытнасці краю). Падтрымліваў сувязі з Я.Тышкевічам, У.Сыракомлем, Ю.Крашэўскім, А.Кіркорам і інш. Пакінуў запіс у «Альбоме» А.Вярыгі-Дарэўскага. У 1862 У.Сыракомля выдаў нарыс «Жыццё і творы Ігната Ходзькі».

Тв.: Бел. пер. — Успаміны квестара: (фрагметны з аповесці) // Край=Kraj: Дыялог на сумежжы культур. Магілёў, 2000.

Г.А.Каханоўскі.

ХО́ДЗЬКА Іосіф Іванавіч (6.12.1800, г.п. Крывічы Мядзельскага р-на Мінскай вобл. — 21.2.1881), геадэзіст і тапограф. Ген.-лейтэнант. Сын *Я.Ходзькі*, брат *А.Ходзькі* і *М.Ходзькі*. Скончыў Віленскі ун-т (1821). У 1822 залічаны ў Корпус ваен. тапографаў і распачаў трыянгуляцыйныя работы на З Латвіі, у Літве, Гродзенскай і Мінскай губ. З 1831 праводзіў тапагр. работы на Дунаі і Басфоры, у 1845—53 Закаўказскую трыянгуляцыю, у выніку якой было вызначана 1386 пунктаў па геагр. становішчы і выш. над узроўнем мора, што дало магчымасць у далейшым рабіць дакладныя здымкі Закаўказзя. Узнагароджаны вял. Канстанцінаўскім медалём (1869).

Літ.: Большаков Н.Н., Вайнберг В.В., Никитин П.Н. И.Ходзько — ученый-геодезист. М., 1960; Furier A. Józef Chodźko, 1800—1881: Polski badacz Kaukaza. Warszawa, 2001. *В.А.Ярмоленка.*

ХО́ДЗЬКА Леанард (6.11.1800, в. Аборак Маладзечанскага р-на Мінскай вобл. — 12.3.1871), гісторык, публіцыст, выдавец. Вучыўся ў Віленскім

Л.Ходзька.

Я.Ходзька.

ун-це (1816—17). Чл. т-ва *філарэтаў*, дзе зблізіўся з А.Міцкевічам, Я.Чачотам, Т.Занам. З 1819 сакратар кампазітара М.К.Агінскага. У 1822 эміграваў, з 1826 у Парыжы. Пісаў на польскай і франц. мовах. Аўтар паэмы «Залессе» (1821), у якой услаўляў прыгажосць навакольля, зрабіў малюнкі Залесся (маёнтак М.К.Агінскага каля г. Смаргонь). Выдаў зб-кі твораў Міцкевіча (1828) і І.Красінскага (1830), мемуары Агінскага (т. 1—4, 1827—28), працы па гісторыі, геаграфіі, статыстыцы, у т.л. «Польшча» (1836—41), у якой шмат матэрыялаў пра Беларусь. Напісаў біяграфію Т.Касцюшкі (1837), «Папулярную гісторыю Польшчы» (1863). Сабраў 125 тамоў дакументаў па гісторыі Польшчы, Беларусі, Украіны і інш.

ХО́ДЗЬКА (Барэйка) Міхал (1808, г.п. Крывічы Мядзельскага р-на Мінскай вобл. — 2.5.1879), паэт, перакладчык, паліт. дзеяч. Сын Я.*Ходзькі*, брат А.*Ходзькі* і І.І.*Ходзькі*. Вучыўся ў Віленскім ун-це, належаў да т-ваў *філаматаў* і *філарэтаў*. Удзельнічаў у паўстанні 1830—31, пасля яго падаўлення інтэрніраваны прускімі ўладамі ў г. Мемель (Клайпеда). Эміграваў у Францыю, быў членам карбанарскіх і масонскіх груповак у Парыжы. Нелегальна наведваў радзіму. Уваходзіў у Таварыства літоўскіх і рускіх зямель, арг-цыю «Помста народа». Удзельнічаў у экспедыцыі Ю.Заліўскага (1833). Вярнуўся ў Францыю, у 1848 разам з А.Міцкевічам арганізаваў польскі легіён у Італіі, удзельнічаў у ваен. акцыях. Аўтар паэм «Дзесяць карцін з экспедыцыі ў Польшчу 1833 г.» (1841) і «Шыман Канарскі» (1845), успамінаў «Экспедыцыя ў Польшчу ў 1833 г. аднаго з эмісараў» (1835) і «Міцкевіч і польскі легіён у Італіі» (1862). Перакладаў на польск. мову творы Дж.Байрана «Мазепа» і «Манфрэд». Памёр у Парыжы.

Тв.: Dziesięć karcin z ekspedycyi ў Polszczu 1833 r.: Karcina VII // Раса нябёсаў на зямлі тугэйшай: Бел. польскамоўная паэзія XIX ст. Мн., 1998. *М.І.Аўсяная.*

ХО́ДЗЬКА (Барэйка) Ян (24.6.1777, г.п. Крывічы Мядзельскага р-на Мінскай вобл. — 10.11.1851), бел. грамадскі дзеяч, пісьменнік. Бацька А.*Ходзькі*, І.І.*Ходзькі*, М.*Ходзькі*. З 1793 цывільнавайск. камісар Ашмянскага пав., з 1795 асэсар суда ў Паставах, з 1798 падсудак, з 1808 падкаморы Вілейскага пав., з 1811 старшыня Гал. цывільнага суда ў Мінску, інспектар школ у Віленскай, Магілёўскай і Віцебскай губ. Адзін з арганізатараў масонскіх лож у Мінску і Вільні. Прытрымліваўся памяркоўнаасветніцкіх поглядаў. Прыхільнік асветы для народа. За сувязь з т-вам *філаматаў* у 1826 зняволены. За ўдзел у паўстанні 1830—31 сасланы на Урал (1830—34). Пісаў на польскай мове. Класіцыст, потым псеўдакласіцыст-маралізатар. Аўтар камедыі «Вызваленая Літва, або Пераход Нёмана» (1812), трагедыі «Кракус» (нап. 1816), аповесцей «Пан Ян са Свіслачы...» (1821) і «Брат і сястра» (1845), трактата «Аб эксдывізіях, або Аб судовым падзеле маёнтка даўжніка на карысць крэдытораў» (1816), успамінаў і артыкулаў па гісторыі Міншчыны, адметных жывасцю апавядання і значнай колькасцю беларусізмаў. Друкаваўся ў час. «Dziennik Wileński» («Віленскі дзённік»), альманаху «Rubon» («Рубон») і інш. П'есы Х. ставіліся ў Мінску на аматарскай сцэне ў 1812.

Тв.: Pisma rozmaite autora «Pana Jana ze Świsłoczy». T. 1—12. Wilno, 1837—42; Diecezja Mińska około 1830 roku. T. 1. Struktury parafialne. Lublin, 1998.

Літ.: Chodźko D.C. Jan Chodźko: Obrazek życiorysowy // Teka Wileńska. 1858. № 5; Turska H. Język Jana Chodźki. Wilno, 1930; Мархель У. Як свечка перад згасаннем // Мархель У. Прысутнасць былога. Мн., 1997. *У.І.Мархель.*

ХО́ДЛЕР, Годлер (Hodler) Фердынанд (14.3.1853, Берн — 19.5.1918), швейцарскі жывапісец; адзін з буйнейшых мастакоў стылю *мадэрн*. Вучыўся ў Б.Мена ў Жэневе (1871—76). У творчасці схіляўся да нац.-рамант. ідэі, філас. *сімвалізму*. Лепшыя творы (кампазіцыі на тэмы нац. гісторыі і фальклору, партрэты, пейзажы і інш.) адметныя манументальнасцю, напружанасцю дынамічнай кампазіцыі, вастрынёй лінейных рытмаў, лаканізмам: «Ноч» (1890), «Дзень» (1900), «Дрывасек» (1910), «Жэнеўскае возера», фрэска «Выступленне іенскіх студэнтаў у 1813» у Іенскім ун-це (1908).

Літ.: Варшавский Л.Р. Ф.Ходлер. М., 1980.

ХО́ДСКІ Леў Георгіевіч (н. 22.9.1924, г. Ізюм Харкаўскай вобл., Украіна), бел. вучоны ў галіне неарган. хіміі. Д-р тэхн. н. (1984), праф. (1986). Скончыў Харкаўскі політэхн. ін-т (1953). З 1956 у Ін-це агульнай і неарган. хіміі Нац. АН Беларусі (у 1964—89 заг. лабараторыі). Навук. працы па вывучэнні заканамернасцей сувязі «склад—уласцівасць—мікраструктура» ў аксідных шклоўтваральных сістэмах, а таксама ўмоў сінтэзу токаправодных і антыкаразійных пакрыццяў, па сінтэзе і фізіка-хім. даследаванні паўправадніковага шкла.

Тв.: Влияние добавок окислов $R_2O_5(RO_3)$ на электропроводность кристаллизующегося титансодержащего стекла (разам з В.У.Таўгенем) // Весці АН БССР. Сер. хім. навук. 1976. № 6; Об оценке температурной зависимости вязкости стекол и эмалей // Там жа. 1980. № 5; Химически устойчивые стеклоэмали. Мн., 1991.

ХО́ДСКІН, Годскін, Ходжскін (Hodgskin) Томас (1787—1869), англійскі эканаміст. Прыхільнік прац. тэорыі вартасці, паводле якой праца разглядалася як адзіная крыніца вартасці і абвяргалася ўяўленне аб капітале як самадастатковай сіле. Прапанаваў утапічны праект свабоднай федэрацыі незалежных вытворцаў, здольнай, на яго думку, прыпыніць развіццё капіталізму. Верыў у сілу розуму і пераканання, таму настойваў на мірных формах барацьбы за правы працоўных. Працы Х. паўплывалі на фарміраванне светапогляду Р.*Оўэна*.

Тв.: Рус. пер. — Соч. М., 1938.

Ф.Ходлер. Дзень. 1900.

ХО́ДЦАЎСКАЯ СУКО́ННАЯ ФА́БРЫКА. Дзейнічала ў 1900—13 у маёнтку Ходцы Сенненскага пав. (цяпер вёска ў Сенненскім р-не Віцебскай вобл.). Мела паравую машыну. У 1913 працавала 115 рабочых.

ХО́ДЦЫ, Л ю б а ч, возера ў Сенненскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Чарнагосніца, каля в. Ходцы, за 18 км на ПнУ ад г. Сянно. Пл. 0,53 км^2, даўж. 1,6 км, найб. шыр. 500 м, найб. глыб. 7,2 м, даўж. берагавой лініі 4,4 км. Пл. вадазбору 55,3 км^2. Катлавіна лагчынная тыпу, падзяляецца на паўн. і паўд. плёсы. Усх. схілы катлавіны выш. 15—18 м, пераважна пад ворывам, зах. да 25 м, параслі хмызняком. Зах. берагі зліваюцца са схіламі, усх. часткова забалочаныя. Мелкаводдзе пясчанае, глыбей дно ілістае. Зарастае ўздоўж берагоў. Упадае ручай з воз. Ліпна, выцякае ў воз. Тросна.

ХО́ДЦЫ, вёска ў Сенненскім р-не Віцебскай вобл., на ўсх. беразе воз. Ходцы, на аўтадарозе Сянно—Віцебск. Цэнтр сельсавета і камунальнага унітарнага с.-г. прадпрыемства. За 21 км на ПнУ ад г. Сянно, 36 км ад Віцебска. 397 ж., 168 двароў (2003). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. У Х. у 1900—13 дзейнічала *Ходцаўская суконная фабрыка.*

ХО́ДЫРАЎ Віктар Іванавіч (н. 8.6.1939, г. Арэнбург, Расія), бел. вучоны ў галіне тэхналогіі машынабудавання. Д-р тэхн. н. (1986), праф. (1986). Акад. Бел. інж. акадэміі (1988). Чл. Нью-Йоркскай АН (1990). Скончыў Куйбышаўскі індустр. ін-т (1962). З 1970 у Магілёўскім тэхн. ун-це (у 1973—86 і з 1997 заг. кафедры, у 1987—97 рэктар). Навук. працы па мех. і фіз.-тэхн. апрацоўцы, новых тэхналогіях мех. і вакуумнай апрацоўкі матэрыялаў для машынабудавання і абароннай прам-сці.

Тв.: Обработка наружных поверхностей вращения ротационными резцами. Орел, 1975 (разам з В.Я.Жастковым); Модификация металлов при низкоэнергетическом воздействии (у сааўт.) // Структурно-морфологические основы модификации материалов методами нетрадиционных технологий. Обнинск, 1991.

ХО́ЖАЎ (Chorzów), горад на Пд Польшчы, у Шлёнскім ваяводстве, прамысл. цэнтр Верхнесілезскай агламерацыі. 123,6 тыс. ж. (1997). Трансп. вузел. Здабыча каменнага вугалю. Прам-сць: чорная металургія, хім., маш.-буд., шкляная, харч., трыкатажная, паліграфічная.

ХО́ЗЕРАЎ Іван Макаравіч (5.2.1889, г. Смаленск, Расія — 21.3.1947), расійскі і бел. мастацтвазнавец, гісторык архітэктуры. Вучыўся на аддзяленні Маскоўскага археал. ін-та ў Смаленску (1916—19). Працаваў у Смаленскім дзярж. музеі (да 1941), з 1946 нач. аддзела аховы помнікаў Упраўлення па справах архітэктуры пры СМ Беларусі. Даследаваў помнікі стараж. дойлідства Полацка (Сафійскі сабор, тры Бельчыцкія царквы, 1928; зрабіў графічную рэканструкцыю Спаса-Праабражэнскай царквы Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра, 1927), Віцебска (абмеры Дабравешчанскай царквы), Смаленска, фрэскавыя размалёўкі ў Полацку, Віцебску, з 1946 — Гродзенскую Барысаглебскую царкву.

Тв.: Да пытання аб Спасаўскай царкве ў Полацку // Гіст.-археал. зб. Мн., 1927. № 1; Полацкая архітэктура XI—XII стст. у святле новых даследаванняў // Маладосць. 1991. № 6—8, 10; Белорусское и смоленское зодчество XI—XIII вв. Мн., 1994.

Літ.: В о р о н и н Н.Н. И.М.Хозеров // Краткие сообщения Ин-та истории материальной культуры АН СССР. М., 1948. Вып. 19; Ш т ы х о в Г.В. Древнеполоцкое каменное зодчество // Белорусские древности. Мн., 1967. *Г.В.Штыхаў.*

«ХОЗЯ́ИН», штомесячны вытворчы часопіс. Выдаецца з 1925 у Мінску (з 1925 на бел., у 1953—62 на бел. і рус., з 1963 на рус. мове). Спачатку наз. «Плуг», у 1929—33 — «Шляхі калектывізацыі», у 1953—56 — «Калгаснік Беларусі», у 1957—90 — *«Сельское хозяйство Белоруссии»*, з 1991 сучасная назва. Асвятляе дасягненні с.-г. навукі, перадавы вопыт, пытанні інтэнсіфікацыі с.-г. вытв-сці, у т.л. фермерскіх гаспадарак, дае парады па садоўніцтве, агародніцтве, пчалярстве і кветкаводстве.

ХОЙЛ (Hoyle) Фрэд (24.6.1915, Бінглі, Вялікабрытанія — 20.8.2001), англійскі астраном, папулярызатар навукі, пісьменнік. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1957), Каралеўскага астр. т-ва (1940; у 1971—73 прэзідэнт). Замежны чл. Нац. АН ЗША (1969). Скончыў Кембрыджскі ун-т (1939), дзе і працаваў (з 1967 дырэктар Ін-та тэарэт. астраноміі). З 1975 у Кардыфскім ун-це. Навук. працы па астрафізіцы, касмагоніі Сонечнай сістэмы, пазагалактычнай астраноміі. Прапанаваў мадэль стацыянарнага сусвету з бясконцым утварэннем рэчыва падчас яго расшырэння (1948), увёў тэрмін «Вялікі выбух» для пач. стадыі касмалагічнай эвалюцыі (1950). Пастуляваў асн. працэсы нуклеасінтэзу ў зорках (1957, з М. і Дж. Бэрбіджамі, У.А.*Фаўлерам*). Выказаў гіпотэзу аб занясенні жыцця на Зямлю мікраарганізмамі з міжзоркавай прасторы (тэорыя панспермій). Аўтар больш як 40 навук. і навук.-папулярных кніг, навук.-фантастычных раманаў. Каралеўскі медаль (1974). Яго імем названа малая планета.

Тв.: Astronomical origins of life: Steps towards panspermia. Boston, 1999 (разам з Н.Ч.Вікрамасінгхам); Рус. пер. — Нейтринные процессы и образование пар в массивных звездах и Сверхновых. М., 1967 (разам з У.Фаўлерам); Галактики, ядра и квазары. М., 1968; Андромеда. М., 1991 (разам з Дж.Эліятам).

Ф.Хойл.

М.М.Касцюковіч.

ХО́ЙНА, вёска ў Пінскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 20 км на Пд ад горада і 24 км ад чыг. ст. Пінск, 185 км ад Брэста. 465 ж., 179 двароў (2003). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі.

ХО́ЙНІКІ, горад, цэнтр Хойніцкага р-на Гомельскай вобл. За 103 км ад Гомеля, 3 км ад канцавой чыг. ст. Хойнікі, чыг. веткі Васілевічы—Хойнікі лініі Калінкавічы—Гомель. Аўтадарогамі злучаны з Рэчыцай, Калінкавічамі. Знаходзіцца ў зоне ўплыву катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. 14,6 тыс. ж. (2002). Працуюць з-ды аўтарамонтны, жалезабетонных вырабаў, *Хойніцкі кансервавы завод*, масласырзавод, тарфяны, філіял Гомельскага з-да «Гідрапрывод», ф-ка маст. вырабаў, дрэваапрацоўчы камбінат, *Хойніцкі краязнаўчы музей*, царква, малітоўны дом евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Цэнтр маст. рамяства. Брацкія могілкі сав. воінаў, партызан і падпольшчыкаў, брацкая магіла славацкіх

Горад **Хойнікі**.

партызан. Помнікі: землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну і ў гонар воінаў кав. корпуса; землякам, якія загінулі ў Афганістане; жалобы наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Помнік архітэктуры — сядзіба (19—20 ст.).

Вядомы з 1512 як вёска т.зв. Брагінскага графства ў ВКЛ. Належалі Вішнявецкім, Шуйскім, Прозарам. З сярэдзіны 16 ст. мястэчка, у Рэчыцкім пав. З канца 17 ст. цэнтр воласці. У 17—18 ст. існаваў *Хойніцкі замак*. З 1793 у Рас. імперыі, цэнтр воласці Рэчыцкага пав. Мінскай губ. У канцы 19 ст. ў Х. 2,7 тыс. ж., 2 спіртзаводы, жалезаапрацоўчы, лесапільны і колавы з-ды, 2 вадзяныя млыны, 2 школы, Пакроўская царква, каплён, 3 сінагогі, 26 крам, 2 заезныя двары, паштовая станцыя. З 1919 у складзе Гомельскай губ. РСФСР. З 8.12.1926 цэнтр раёна Рэчыцкай, у 1927—30 — Гомельскай акруг БССР. З 27.9.1938 гар. пасёлак Палескай вобл. У 1939 — 3,4 тыс. ж., лесапільны з-д. 25.8.1941 акупіраваны ням. фашыстамі, якія амаль цалкам спалілі і разбурылі Х., загубілі 184 жыхары. З ліст. 1941 да ліст. 1943 у Х. і раёне дзейнічала *Хойніцкае патрыятычнае падполле*. 15.11.1942 бел. і ўкр. партызаны разгромілі ў Х. фаш. гарнізон. Вызвалены 23.11.1943 воінамі 61-й арміі Бел. фронту ў ходзе *бітвы за Дняпро 1943*. З 1954 у Гомельскай вобл. З 10.11.1967 горад.

М.С.Скрыпчанка (гісторыя).

ХО́ЙНІЦКА-БРА́ГІНСКІЯ ВЫШЫ́НІ. У Хойніцкім і на З Брагінскага р-наў Гомельскай вобл., паміж ніжнім цячэннем рэк Прыпяць і Дняпро; у складзе *Гомельскага Палесся*. Спадзістахвалістая паверхня, месцамі плоская, выш. 125—140 м, на ўзгорках да 153—157 м, з адноснымі перавышэннямі 3—10 м. Слаба нахілена на Пд. Складзена з водна-ледавіковых адкладаў часу адступання дняпроўскага ледавіка, алювіяльных паазерскага гарызонту і сучасных алювіяльных, азёрных, балотных і інш. Вылучаюцца 2 ланцугі краявых ледавіковых утварэнняў (працяг Юравіцкага ўзвышша), сярод якіх трапляюцца камавыя ўзгоркі. Уздоўж паўд. схілу паласа пясчаных дзюн. Характэрны суфазійныя западзіны, некат. запоўнены вадой. Глебы ў асн. дзярнова-палева-падзолістыя слаба- і сярэднеападзоленыя сугліністыя, пераважна разараныя; радзей дзярнова-падзолістыя слабаападзоленыя супясчаныя і дзярнова-падзоліста-глеяватыя сугліністыя; у катлавінах і западзінах — тарфяна-балотныя. Пад лесам 12% плошчы; невял. ўчасткі кусцікава-зеленамошных лясоў. Пад с.-г. ўгоддзямі да 70%, у т.л. пад ворывам 30% тэрыторыі.

ХО́ЙНІЦКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала з ліст. 1941 да ліст. 1943 (арганізатар і кіраўнік Я.І.Казачук) у г. Хойнікі і раёне Гомельскай вобл. Аб'ядноўвала каля 10 груп (больш за 60 чал.): у Хойніках (кіраўнік М.М.Даўгапалаў), на чыг. ст. Хойнікі (Г.І.Лаўрусенка) і Аўрамаўская (П.В.Бот), у вёсках Карчовае (М.А.Колас), Паташня (Ю.М.Цішкевіч), Стралічава (У.А.Табачны) і інш. Падпольшчыкі вялі паліт. агітацыю сярод насельніцтва, выпускалі і распаўсюджвалі лістоўкі, праводзілі дыверсіі на электрастанцыі, тэлеф. лініі, лесакладзе, падтрымлівалі сувязь з партызанамі, здабывалі для іх зброю, боепрыпасы, медыкаменты. У студз. 1942 у клубе г. Хойнікі яны наладзілі паказ даваенных кінафільмаў «Партбілет» і «За Савецкую Радзіму», вясной арганізавалі ўцёкі сав. ваеннапалонных з хойніцкай турмы; вывелі да партызан 57 ваенных са славацкага гарнізона. У барацьбе з фаш. захопнікамі загінула 60 падпольшчыкаў. У Хойніках на брацкіх могілках сав. воінаў, партызан і падпольшчыкаў пастаўлены помнік.

ХО́ЙНІЦКІ ЗА́МАК. Існаваў у 17—18 ст. у г. *Хойнікі* Гомельскай вобл. Пабудаваны ў 1-й пал. 17 ст. кн. Вішнявецкімі. Пазней перайшоў да кн. Прозараў, з 1698 уладанне пана Слушкі, у якога ў 1721 замак выкупіў біскуп Юзаф Парышэвіч. Займаў невял. пясчаную дзюну ў забалочанай пойме р. Квеся. Выцягнутая з Пн на Пд авальная пляцоўка замка (35 × 25 м) была абкружана запоўненым вадой ровам, які з боку мястэчка меў шыр. 28—30 м, з інш. бакоў — 10—18 м. Акрамя таго, быў ахаваны вял. поймай. На земляным вале стаялі драўляныя абарончыя сцены-гародні, мелася і ўязная вежа з варотамі. Сувязь з горадам ажыццяўлялася па дамбе і драўляным мосце. Паводле інвентара за 1721, Х.з. быў абкружаны парканам, меў 2-павярховую ўязную вежу, зрубленую з брусоў і накрытую дранкай. Першы паверх вежы займалі ўязны праезд з варотамі і 2 памяшканні, адведзеныя пад турму, на 2-м паверсе зала са шклянымі вокнамі ў драўляных рамах. На ўзроўні 2-га паверха ўкругавую ішоў балкон. На падворку замка размяшчаліся гасп. пабудовы. Х.з. спыніў існаванне ў 18 ст.

М.А.Ткачоў.

ХО́ЙНІЦКІ КАНСЕ́РВАВЫ ЗАВО́Д. Пабудаваны ў г. Хойнікі Гомельскай вобл. ў 1949. Рэканструяваны ў 1954, 2000—2002. З 2001 наз. Камунальнаунітарнае прадпрыемства «Хойніцкі кансервавы завод». Асн. прадукцыя (2002): пладовыя і агародніннныя кансервы, сокі, павідла, кетчупы, соусы і інш.

ХО́ЙНІЦКІ КРАЯЗНА́ЎЧЫ МУЗЕ́Й. Засн. ў 1981, адкрыты ў 1982 у г. Хойнікі Гомельскай вобл. як гісторыка-краязнаўчы на грамадскіх пачатках, з 1992 дзярж., з 1996 сучасная назва. Пл. экспазіцыі 371 м^2, каля 2 тыс. экспанатаў асн. фонду (2002). Сярод экспанатаў крамянёвыя каменныя прылады працы, керамічныя вырабы 11—13 ст., паліваная кераміка 17—18 ст. з раскопак *Хойніцкага замка*, матэрыялы пра ўдзел жыхароў Хойніцкай вол. ў паўстанні 1863—64, рэв. выступленні сялян у 1905, калектывізацыю, сав. рэпрэсіі, дзейнасць падполля і партыз. рух у Вял. Айч. вайну (гл. *Хойніцкае патрыятычнае падполле*). У экспазіцыі інтэр'ер сял. хаты канца 19 — пач. 20 ст., матэрыялы пра знакамітых землякоў, вырабы саломапляцення, разьбы па дрэве, чаканкі, вязання, карціны мясц. мастакоў, гербарыі раслін, чучалы птушак і жывёл раёна. Раздзел «Рэха Чарнобыля» распавядае пра ўплыў вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

М.С.Скрыпчанка.

ХО́ЙНІЦКІ РАЁН. Размешчаны на ПдУ Гомельскай вобл. Утвораны 8.12.1926, у сучасных межах з 25.12.1962. Пл. 2 тыс. км^2. Нас. 25 тыс. чал. (2003), гарадскога 57,6%. Сярэдняя шчыльн. 13 чал. на 1 км^2. Цэнтр — г. *Хойнікі*. Раён уключае 95 сельскіх нас. пунктаў, 7 сельсаветаў: Алексіцкі, Барысаўшчанскі, Велікаборскі, Дварышчанскі, Казялужскі, Паселіцкі, Стралічаўскі. У выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у 1986 з раёна эвакуіравана і адселена 40% насельніцтва з 48 сельскіх нас. пунктаў, скасавана 6 сельсаветаў (Амелькаўшчынскі, Аравіцкі, Кажушкаўскі, Радзінскі, Рудакоўскі, Тульгавіцкі), 7 калгасаў і саўгасаў, з карыстання выведзены 88 тыс. га зямлі. За 1982—92 колькасць насельніцтва ў раёне скарацілася на 23 тыс. чал.

Тэр. раёна ў межах *Гомельскага Палесся*. Паверхня раўнінная з участкамі марэнных узгоркаў, цэнтр. ч. займаюць *Хойніцка-Брагінскія вышыні*. Амаль уся паверхня (98%) на выш. 110—140 м. Найвыш. пункт 160 м (на ПнУ ад в. Стралічава). Агульны нахіл паверхні з ПнУ на ПдЗ. Карысныя выкапні: торф, буд. пяскі. Сярэдняя т-ра студз. -6,6 °С, ліп. 18,6 °С. Ападкаў 565 мм за год. Вегетац. перыяд 195 сутак. Найб. р. Прыпяць з прытокамі Віць і Тур'я; р. Несвіч (прыток Ніжняй Брагінкі). Меліярац. каналы: Амелькаўскі,

Бонда, Варанец, Гарошкаўскі, Ізбынька, Кажушкаўскі, Кліўскі, Конанаўскі, Краснагорскі, Стралічаўскі, Шчэлбінскі і інш. Глебы с.-г. угоддзяў: дзярнова-падзолістыя (34,4%), тарфяна-балотныя (26,8%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (17,8%), дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя (12,4%) і інш. Пад лесам 47,7% плошчы. Найб. пашыраны на Пн раёна. Пераважаюць хваёвыя, бярозавыя, дубовыя, асінавыя, грабавыя лясы; штучныя насаджэнні (23%) пераважна хваёвыя і дубовыя. Пад балотамі 3,8% тэрыторыі. На тэр. раёна *Палескі радыяцыйна-экалагічны запаведнік* (частка). Помнікі прыроды мясц. значэння: паркі «Барысаўшчына» і «Хойнікі», хвоя «Каралева» за 7 км ад г. Хойнікі каля аўтадарогі Хойнікі—Рэчыца.

Агульная плошча с.-г. угоддзяў 46,5 тыс. га, з іх асушаных 19,5 тыс. га. На 1.1.2003 у раёне 9 камунальных с.-г. унітарных прадпрыемстваў, у іх ліку агракамбінат «Віць», «Грачыхіна», «Барысаўшчына», «Веляцін», «Велікаборскі», «Мележа», «Судкова», «Хойніцкае»; рэсп. эксперым. база «Стралічава», падсобная гаспадарка «Дубровіца». Сельская гаспадарка спецыялізуецца на малочнай, камбінаванай і мясной жывёлагадоўлі, развіцці збожжавай гаспадаркі, нарыхтоўцы кармоў і бульбаводстве. Прадпрыемствы прам-сці: харч. (кансервы з агародніны і садавіны, сыр, малочныя прадукты і інш.), камбікормавай, буд. матэрыялаў (жалезабетонныя вырабы), металаапр. (гідраабсталяванне, рамонт рухавікоў і агрэгатаў аўтамабіляў, рамонт і абслугоўванне с.-г. машын), паліўнай (тарфяныя брыкеты), паліграф., дрэваапр. (мэбля); вытв-сць маст. вырабаў (швейныя вырабы і сувеніры з саломкі), лясгас. На тэр. раёна праходзяць чыгунка Васілевічы—Хойнікі і аўтадарогі Калінкавічы—Хойнікі—Брагін, Хойнікі—Рэчыца і інш. У раёне 10 сярэдніх (у т.л. 3 школы-сады), 3 базавыя (у т.л. 2 школы-сады), муз., спарт. школы, ПТВ, Дом творчасці дзяцей і юнацтва, Дом рамёстваў, 9 дашкольных устаноў, 27 клубаў, 27 бібліятэк, 2 бальніцы, 3 амбулаторыі, 17 фельч.-ак. пунктаў. *Хойніцкі краязнаўчы музей*, філіял краязнаўчага музея імя І.П.Мележа ў в. Глінішча (радзіма нар. пісьменніка Беларусі). Помнікі архітэктуры: сядзіба (2-я пал. 19 — пач. 20 ст.) у в. Барысаўшчына. Выдаецца газ. «Ленінскі сцяг».

Літ.: Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Гомельская вобл. Мн., 1985; Памяць: Гіст.-дак. хроніка Хойніцкага р-на. Мн., 1993. *Р.Р.Паўлавец, А.С.Содаль.*

ХО́КАН IV (Haakonsson), Хокан-сан Стары (Haakon den Gamle; 1204—17.12.1263), кароль Нарвегіі [1217—63]. Абапіраўся на служылае дваранства, пасля грамадз. войнаў 2-й пал. 12 — пач. 13 ст. ўмацаваў каралеўскую ўладу (да 1240). У 1251 заключыў дагавор з Ноўгарадам пра ўрэгуляванне пагран. адносін. Абвясціў уладу нарв. кароны над Грэнландыяй (1261) і Ісландыяй (1262). Памёр у час ваен. паходу ў Шатландыю. Хроніку жыцця Х. склаў у 1264—65 ісландзец С.Тордарсан.

ХО́КАН VII (Haakon, 3.8.1872, Шарлотэнлун, цяпер у межах г. Капенгаген — 21.9.1957), кароль Нарвегіі [1905—57]. З дынастыі *Глюксбургаў*. Выбраны каралём Нарвегіі пасля скасавання *шведска-нарвежскай уніі 1814—1905* і ўтварэння самаст. нарв. дзяржавы. У 1-ю сусв. вайну захоўваў нейтралітэт краіны. У 2-ю сусв. вайну пасля акупацыі Нарвегіі ням.-фаш. войскамі ў ходзе *Нарвежскай аперацыі 1940* разам з урадам знаходзіўся ў эміграцыі (Лондан; 1940—45), не прызнаваў нарв. калабарацыянісцкі ўрад В.*Квіслінга*.

С.У.Хокінг.

ХО́КІНГ (Hawking) Стывен Уільям (н. 8.1.1942, г. Оксфард, Вялікабрытанія), англійскі фізік-тэарэтык. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1974), Нац. АН ЗША (1992). Скончыў Оксфардскі (1962) і Кембрыджскі (1966) ун-ты. З 1965 у Кембрыджскім ун-це (з 1977 праф.). Навук. працы па агульнай тэорыі адноснасці, тэарэт. астрафізіцы і касмалогіі. Даказаў тэарэму аб сінгулярнасці прасторы-часу (тэарэма Х.—Пенроўза, 1960-я г.). Паказаў, што на пач. этапах эвалюцыі Сусвету маглі ўтварацца чорныя міні-дзіры (памерам з элементарную часціцу). У сярэдзіне 1970-х г. распрацаваў тэорыю «выпарэння» чорных дзір за кошт квантавых эфектаў і нараджэння пар часціц і антычасціц (выпрамяненне Х.). Аўтар шэрагу навук.-папулярных кніг. З 1962 паралізаваны, з 1985 страціў магчымасць маўлення, выкарыстоўвае камп'ютэрны галасавы сінтэзатар. Прэміі А.Эйнштэйна 1978, Вольфа 1988.

Тв.: Рус. пер. — Крупномасштабная структура пространства-времени. Новокузнецк, 1998 (разам з Дж.Элісам); Природа пространства и времени. Ижевск, 2000 (разам з Р.Пенроўзам); Краткая история времени: От большого взрыва до черных дыр. СПб., 2001; Черные дыры и молодые вселенные. СПб., 2001. *М.М.Касцюковіч.*

ХОЛ (англ. hall), у традыцыйным англ. жытле агульны пакой, прыёмная зала з лесвіцай на верхні паверх. У сучасных грамадскіх будынках і гасцініцах — невял. зала для адпачынку, чакання, сустрэч і інш.

ХОЛ (Hall) Грэнвіл Стэнлі (1.2.1846, г. Ашфілд, штат Масачусетс, ЗША — 24.4.1924), амерыканскі псіхолаг; адзін з заснавальнікаў *педалогіі*, прыхільнік эксперыментальнай педагогікі. У 1878—80 вучыўся ў Германіі ў Г.Т.Фехнера, В.*Вунта* і інш. З 1881 праф. ун-та Дж.Хопкінса (г. Балтымар). У 1889—1920 праф. і прэзідэнт Кларкскага ун-та, дзе стварыў першы ў ЗША ін-т дзіцячай псіхалогіі. Адзін з арганізатараў і першы прэзідэнт (1892) Амер. псіхал. асацыяцыі. Пры даследаванні дзіцячай псіхікі выкарыстоўваў апытальнікі, у якіх дзеці паведамлялі пра свае пачуцці (маральныя, рэлігійныя і інш.), адносіны да інш. людзей. Методыка такіх апытанняў сустрэла рэзкую крытыку, бо паведамленні дзяцей прызнаваліся за дакладную крыніцу інфармацыі пра саміх сябе. Прытрымліваўся тэорыі рэкапітуляцыі, паводле якой дзіця ў сваім псіхічным развіцці паўтарае стадыі развіцця псіхікі чалавечага роду («Праблемы выхавання», т. 1—2, 1911).

ХОЛ (Hall) Эдвін Герберт (7.11.1855, Горэм, штат Мэн, ЗША — 20.11.1938), амерыканскі фізік. Чл. Нац. АН ЗША (1911). Навук. працы па даследаванні тэрмаэл., тэрмамагн., цеплавых і гальванамагн. з'яў у правадніках. Адкрыў (1879) адну з *гальванамагнітных з'яў*, пазней названую яго імем (гл. *Хола эфект*).

ХО́ЛА ПЕРАЎТВАРА́ЛЬНІК, Хола датчык, вымяральны пераўтваральнік на аснове *Хола эфекту*. Пры дапамозе Х.п. можна вымяраць фіз. велічыні, якія адназначна залежаць ад напружанасці магн. поля. Адрозніваюць вымяральныя і індыкатарныя Х.п. Вымяральныя выкарыстоўваюцца ў магнітометрах, бескантактных амперметрах, перамнажальных прыладах і інш., індыкатарныя служаць для ўстанаўлення факта наяўнасці ці адсутнасці магн. поля ў дадзеным пункце прасторы.

ХО́ЛА ЭФЕ́КТ, узнікненне ў правадніку з токам, змешчаным у магн. поле, электрычнага поля (холаўскай рознасці патэнцыялаў), накіраванага перпендыкулярна да шчыльнасці току і знешняга магн. поля. Адкрыты Э.Г.*Холам* у 1879. Тлумачыцца дзеяннем *Лорэнца сілы* на паток *носьбітаў зараду* (электронаў, дзірак, іонаў). Выкарыстоўваецца для вымярэння індукцыі магн. поля, вызначэння знака зараду рухомых носьбітаў зараду і іх канцэнтрацыі.

У магнетыках да звычайнага Х.э. дадаецца ферамагнітны (спантанны, ці анамальны) Х.э., абумоўлены намагнічанасцю правадніка. У двухмерным правадніку (таўшчыня меншая за сярэднюю даўжыню хвалі дэ Бройля электрона) з токам, змешчаным у магутнае магн. поле (калі энергія цыклатроннага руху электрона праводнасці большая за сярэднюю энергію цеплавога руху), назіраецца квантавы Х.э. — адносіны холаўскай рознасці патэнцыялаў да сілы току ступеньчатым чынам залежаць ад велічыні магн. поля і канцэнтрацыі электронаў. Адкрыты ў 1980 К. фон *Клітцынгам*. Выкарыстоўваецца

ў метралогіі для стварэння эталона эл. супраціўлення.

Літ.: Кучис Е.В. Гальваномагнитные эффекты и методы их исследования. М., 1990; Клитцинг К. фон. Квантованный эффект Холла: Пер. с англ. // Успехи физ. наук. 1986. Т. 150, вып. 1; Штермер Х. Дробный квантовый эффект Холла: Пер. с англ. // Там жа. 2000. Т. 170, № 3.

М.А.Паклонскі.

ХОЛАБАЗІДЫЯМІЦЭ́ТЫ (Holobasidiomycetidae), падклас базідыяльных грыбоў (па класіфікацыі, заснаванай на марфалогіі *базідый*). 2 групы парадкаў (*гіменаміцэты, гастэраміцэты*), 600 родаў, больш за 10 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды. На Беларусі каля 160 родаў, больш за 1,2 тыс. відаў. Пераважна глебавыя *сапратрофы* (напр. *вясёлка, порхаўка, рагацік*), мікарызаўтваральнікі (напр. *падасінавік, падбярозавік, трюфель*), дрэваразбуральнікі (напр. *гняздоўка, губавыя грыбы, дамавыя грыбы*), паразіты раслін (напр. апенька восеньская, танатэфорус агурковы). Многія ўтвараюць буйныя пладовыя целы, у т.л. ядомыя (напр. *баравік, грыбная капуста, шампіньён*). Характэрная асаблівасць — наяўнасць цэльнай, аднаклетачнай, цыліндрычнай або булавападобнай *базідыі* з 4, радзей 2 спорамі на верхавінцы.

С.І.Бельская.

ХО́ЛАД Валерый Міхайлавіч (н. 8.2.1937, г. Віцебск), бел. вучоны ў галіне ветэрынарыі. Д-р біял. н. (1976), праф. (1977). Скончыў Віцебскі вет. ін-т (1959), дзе працуе з 1960 (з 1966 заг. кафедры). Навук. працы па пытаннях хіміі бялкоў крыві, біяхіміі мікраэлементаў, біяхім. метадаў дыягностыкі хвароб.

Тв.: Белки сыворотки крови в клинической и экспериментальной ветеринарии. Мн., 1983; Справочник по ветеринарной биохимии. Мн., 1988 (разам з Г.П.Ярмалаевым).

ХО́ЛАД Валянцін Васілевіч (н. 25.8.1936, в. Пятровічы Смалявіцкага р-на Мінскай вобл.), Герой Сав. Саюза (1982), контр-адмірал (1988). Скончыў Першае вышэйшае ваенна-марское вучылішча падводнага плавання (1958), Ваенна-марскую акадэмію імя М.Г.Кузняцова (1988). У 1958—92 на падводных лодках Паўн. флоту: камандзір групы, старшы пам. камандзіра лодкі, камандзір атамнага падводнага крэйсера, нам. камандзіра злучэння падводных лодак. Капітан 1-га рангу Х. вызначыўся ў працяглым выпрабавальным пераходзе пад ільдамі Арктыкі.

Б.Дз.Далгатовіч.

ХО́ЛАД Мікалай Ігнатавіч (н. 5.2.1937, в. Садовічы Капыльскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1983), праф. (1986). Скончыў БДУ (1961). З 1964 у Бел. эканам. ун-це (у 1994—2002 заг. кафедры). Навук. працы па праблемах матэм. мадэлявання, выкарыстання эканоміка-матэм. метадаў і мадэлей у кіраванні вытв-сцю, планаванні і прагназіраванні сац.-эканам. развіцця Беларусі.

Тв.: Модели показателей роста экономической эффективности сельскохозяйственного производства. Мн., 1980; Прогнозирование эффективности сельскохозяйственного производства. Мн., 1980; Резервы роста эффективности сельскохозяйственного производства. Мн., 1984; Математические методы анализа и планирования. Мн., 1989; Экономико-математические методы и модели. Мн., 1999 (у сааўт.); Высшая математика: Математическое программирование. 2 изд. Мн., 2001 (разам з А.В.Кузняцовым, В.А.Саковічам); Моделирование долгосрочного развития национальной экономики (разам з Ю.Г.Імамутдзінавым, В.Я.Асановічам) // Весн. Бел. дзярж. экан. ун-та. 2002. № 4.

ХО́ЛАДАВА Алена Аляксееўна (н. 6.7.1930, г. Екацярынбург, Расія), бел. і рас. вучоны ў галіне эндакрыналогіі; заснавальнік бел. навукова-практычнай школы эндакрынолагаў. Д-р мед. н. (1981), праф. (1982). Засл. дз. нав. Беларусі (1999). Скончыла Екацярынбургскі мед. ін-т (1955). З 1965 у Чэлябінскім мед. ін-це. З 1984 у Бел. мед. акадэміі паслядыпломнай адукацыі (у 1985—98 заг. кафедры). Навук. працы па клінічнай эндакрыналогіі, сучасных метадах лячэння цукр. дыябету і інш. Распрацавала новы навук. кірунак па медыка-сац. рэабілітацыі насельніцтва на аснове дыягностыкі эндакрынных расстройстваў на ранніх стадыях (ухвалена Еўрап. бюро Сусв. арг-цыі аховы здароўя).

Тв.: Экспертная система диагностики диабетических ангиопатий методами вычислительной ИК-термографии: концепция и критерии. Мн., 1990 (у сааўт.); Болезни щитовидной железы: ранние признаки, дифференциальный диагноз. Мн., 1991 (разам з Л.І.Данілавай); Справочник по клинической эндокринологии. Мн., 1998.

ХОЛАДАГЕ́НТ, халадзільны агент, рабочае рэчыва *халадзільнай машыны* (*хладоны*, аміяк, прапан-прапіленавыя сумесі і інш.). Пры кіпенні або ў працэсе расшырэння адбірае цеплату ад ахаладжальнага аб'екта і перадае яе ахаладжальнаму асяроддзю (вадзе, паветру і інш.). Патрабаванні да Х.: нетаксічнасць, негаручасць, нейтральнасць да канструкцыйных матэрыялаў і інш.



Да арт. **Хола эфект**. Схема вымярэння холаўскай рознасці электрычных патэнцыялаў U_H: 1— праваднік электрычнасці; 2 — токавыя кантакты; 3 — холаўскія кантакты; $\vec{J}$ —шчыльнасць току; $\vec{B}$ —індукцыя знешняга магнітнага поля (перпендыкулярная плоскасці рысунка).

В.В.**Холад**.

Р.У.**Холі**.

ХОЛАДАЎСТО́ЙЛІВАСЦЬ раслін, здольнасць раслін вытрымліваць нізкія дадатныя тэмпературы (1—5 °С) без зніжэння прадукцыйнасці. Адносіцца да генетычна абумоўленых прыкмет. Холадаўстойлівыя расліны (ячмень, авёс, віка, лён, буракі) здольны пад дзеяннем нізкіх дадатных т-р перабудоўваць структурную і функцыян. арганізацыю клетак, што суправаджаецца тармажэннем росту, павелічэннем колькасці бялкоў, амінакіслот і асабліва цукроў. Цеплалюбівыя расліны (агуркі, памідоры, кукуруза, перцы, баклажаны, фасоля) пры нізкіх т-рах пашкоджваюцца і гінуць ад неабарачальных парушэнняў у абмене рэчываў, што праяўляецца ў страце *тургару*, зменай афарбоўкі ліся і інш. Пункты росту і маладое лісце больш устойлівыя да холаду, усходы пашкоджваюцца мацней, чым дарослыя расліны, Х. павышаецца ўнясеннем калійных угнаенняў, у ахаваным грунце — вырошчваннем раслін пры паніжанай вільготнасці і добрым асвятленні, загартоўваннем. Гл. таксама *Зімаўстойлівасць, Марозаўстойлівасць*.

ХО́ЛАШЫ (Hollósy) Шыман (2.2.1857, г. Сігет, Румынія — 8.5.1918), венгерскі жывапісец. Вучыўся ў Мюнхенскай АМ (1878—82), з 1886 кіраваў Маст. школай у г. Мюнхен. У 1896 арганізаваў калонію мастакоў у Надзьбанье (цяпер г. Бая-Марэ, Румынія). У творах адлюстроўваў рэчаіснасць Венгрыі, яе нац. своеасаблівасць, звяртаўся да прыёмаў пленэрнага жывапісу. Аўтар святочных і светлых па каларыце карцін («Абіранне кукурузы», 1885, і інш.), эскізаў да работы «Марш Ракацы» (1890—1910-я г.).

ХО́ЛДЗІНГ-КО́МПАНІ, холдзінг (англ. holding company ад holding які валодае), акцыянерная кампанія, якая выкарыстоўвае свой капітал для набыцця кантрольных пакетаў *акцый* інш. кампаній з мэтай кантролю і кіравання імі. Часам яна не валодае ўласным

вытв. патэнцыялам і не займаецца вытв. або камерцыйнай дзейнасцю. Адрозніваюць холдзінгі ч ы с т ы я, якія не займаюцца вытв., гандл. або банкаўскай дзейнасцю, і з м е ш а н ы я, якія і самі займаюцца прадпрымальніцтвам у розных сферах. Х.-к. ствараюцца буйнымі карпарацыямі для правядзення адзінай палітыкі і ажыццяўлення адзінага кантролю або для паскарэння працэсу *дыверсіфікацыі*, размеркавання капіталу паміж рознымі галінамі.

ХО́ЛЕВАЯ КІСЛАТА́, гл. ў арт. *Жоўцевыя кіслоты*.

ХО́ЛІ (Holley) Роберт Уільям (28.1.1922, г. Эрбана, ЗША — 11.2.1993), амерыканскі вучоны ў галіне біяхіміі. Чл. Нац. АН ЗША (1968), Амер. акадэміі мастацтваў і навук. Д-р філасофіі (1947). Скончыў Ілінойскі (1942) і Корнелскі (1947) ун-ты. З 1947 у Вашынгтонскім, з 1948 у Корнелскім ун-тах. З 1966 у Ін-це Солка, адначасова з 1968 ва ун-це Каліфорніі (г. Сан-Дыега). Навук. працы па расшыфроўцы будовы індывід. транспартных РНК (тРНК). Атрымаў (1962) высокаачышчаныя прэпараты 3 прыродных тРНК і вызначыў (1965) поўную структуру адной з іх — аланінавай. Нобелеўская прэмія 1968. (з Х.Г.*Каранам*, М.У.*Нірэнбергам*).

В.Ф.Ермакоў.

ХО́ЛІ (Hawley) Стывен (н. 12.12.1951, г. Атава, ЗША), касманаўт ЗША. Бакалаўр у галіне фізікі, д-р філасофіі. Скончыў Канзаскі (1973) і Каліфарнійскі (1977) ун-ты. З 1978 у групе касманаўтаў НАСА. Здзейсніў 5 палётаў у складзе экіпажаў касм. караблёў (КК): 30.8—5.9.1984, 24—29.4.1990, 11—21.2.1997 — на КК «Дыскаверы»; 12—18.1.1986, 23—28.7.1999 — на КК «Калумбія». Правёў у космасе 32,2 сут. 5 медалёў НАСА «За касмічны палёт».

У.С.Ларыёнаў.

ХО́ЛМЕЦКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1926—27. Створаны 8.12.1926 у складзе Рэчыцкай, потым Гомельскай акруг. Цэнтр — в. *Холмеч*. Падзяляўся на 23 сельсаветы. 4.8.1927 скасаваны, тэр. перададзена ў Лоеўскі і Рэчыцкі р-ны.

ХО́ЛМЕЧ, вёска ў Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл., на правым беразе р. Дняпро, каля аўтадарогі Лоеў—Рэчыца. Цэнтр сельсавета і камунальнага с.-г. унітарнага прадпрыемства. За 30 км на ПдУ ад горада і чыг. ст. Рэчыца, 65 км ад Гомеля. 1263 ж., 502 двары (2003). Участак раённага водаканала. Сярэдняя і дзіцяча-юнацкая спарт. школы, Палац культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў.

ХО́ЛМІНАЎ Аляксандр Мікалаевіч (н. 8.9.1925, Масква), расійскі кампазітар. Нар. арт. Расіі (1976). Нар. арт. СССР (1984). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1950). Творчасці ўласціва жанравая і тэматычная шырыня з перавагай оперы і вак.-сімф. музыкі: оперы «Аптымістычная трагедыя» (паст. 1965), «Шынель» (паст. 1975), «Ванька», «Вяселле» (абедзве паст. 1984), «Браты Карамазавы» (паст. 1985); 3 сімфоніі (1973, 1975, 1977), камерна-інстр. ансамблі, творы для голасу з фп., музыка да кінафільмаў і інш. Дзярж. прэмія Расіі 1969. Дзярж. прэмія СССР 1978.

ХО́ЛСТАВА, вёска ў Быхаўскім р-не Магілёўскай вобл., на аўтадарозе Быхаў—Алень. Цэнтр сельсавета і унітарнага камунальнага с.-г. прадпрыемства. За 6 км на ПнЗ ад горада і чыг. ст. Быхаў, 50 км ад Магілёва. 497 ж., 203 двары (2003). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ХО́ЛУЙСКАЯ МІНІЯЦЮ́РА, мініяцюрны жывапіс тэмперай на лакавых вырабах; рускі нар. маст. промысел. Узнік у 1932 у пас. Холуй Іванаўскай вобл. (Расія) на аснове мясц. іканапіснага промыслу (вядомы з 16 ст.) як філіял арцелі «Пралетарскае мастацтва». У 1934 створана Холуйская маст. арцель, у 1960 ф-ка маст. лакавай мініяцюры. Тэхналогія вырабаў з пап'е-машэ запазычана ў майстроў *фядоскінскай мініяцюры*. У Х.м. пераважаюць кампазіцыі на гіст., былінныя, казачныя і сучасныя тэмы, размешчаныя, як правіла, на пейзажных фонах. Вырабы вызначаюцца падкрэсленай дэкаратыўнасцю, засн. на проціпастаўленні яркіх тонаў, пластычнай выразнасцю поз і жэстаў персанажаў, узбуйненымі дэталямі.

Літ.: Искусство Холуя. 2 изд. Ярославль, 1980.

Я.М.Сахута.

ХО́ЛЬБЕЙН, Г о л ь б е й н (Holbein) Ганс Малодшы (каля 1497 або 1498, г. Аўгсбург, Германія — паміж 7.10 і 29.11.1543), нямецкі жывапісец і графік эпохі *Адраджэння*. Вучыўся ў свайго бацькі Хольбейна Старэйшага. У 1515—26 працаваў у Базелі, выканаў ілюстрацыі да «Пахвалы глупству» Эразма Ратэрдамскага (1515). Смеласцю кампазіцыйнага вырашэння і сілай эмацыянальнага ўздзеяння вызначаецца карціна «Мёртвы Хрыстос» (1521), створыў партрэты (Эразма Ратэрдамскага, 1523). У серыі малюнкаў «Вобразы смерці» (вядома пад назвай «Танец смерці», 1524—26) у алегарычнай і гратэскавай форме адлюстраваў падзеі Сялянскай вайны 1524—26 у Германіі. У 1526—28 і з 1532 працаваў у Вялікабрытаніі (з 1536 прыдворны мастак караля Генрыха VIII), дзе раскрыўся яго талент партрэтыста. У творах амаль ювелірную дакладнасць у адлюстраванні дэталей спалучаў з пластычнай і эмацыянальнай цэласнасцю вобраза; графічны партрэт Томаса Мора (1527), жывапісныя партрэты Ніколаса Кратцэра, астранома англійскага караля Генрыха VIII (1528), ням. купца Г.Гісцэ (1532), франц. пасла Ш.Марэта (каля 1534—35), каралевы Джэйн Сеймур (1536—37), Генрыха VIII (1539—40). Мастацтва Х. паўплывала на развіццё зах.-еўрап. партрэта.

Літ.: Г.Гольбейн Младший: [Альбом]. М.; Л., 1962; Л и б м а н М.Я. Дюрер и его эпоха. М., 1972.

Г.Хольбейн Малодшы. Партрэт Ніколаса Кратцэра, астранома англійскага караля Генрыха VIII. 1528.

ХО́ЛЬЧА, адно з найбуйн. балот Беларусі на У Пінскага, З Лунінецкага і ПнЗ Столінскага р-наў Брэсцкай вобл., у вадазборы рэк Бобрык і Прыпяць. Нізіннага тыпу. Пл. 25,6 тыс. га, у межах прамысл. паклаву 20,3 тыс. га. Глыб. торфу да 2,8 м, сярэдняя 1,3 м. Торф здабываюць на паліва і ўгнаенне. Ёсць сапрапель. Асушана больш за палавіну балота. На асушаных землях сеюць травы, збожжавыя і прапашныя культуры. На неасушаных землях пераважае асакова-разнатраўная расліннасць.

ХО́МЕР, Г о м е р (Homer) Уінслаў (24.2.1836, г. Бостан, ЗША — 29.9.1910), амерыканскі мастак. З 1854 працаваў як літограф, у 1857—74 часопісны ілюстратар. У час грамадзянскай вайны 1861—65 ваен. карэспандэнт. Наведаў Францыю і Вялікабрытанію. З 1862 займаўся жывапісам, удасканальваўся самастойна, вывучаў творы амер. і франц. жывапісцаў. Адлюстроўваў буйнафігурныя сцэны з жыцця простых людзей на фоне напісаных сакавітымі фарбамі амер. пейзажаў: «Абедзенная гадзіна» (1873), «Спадарожны вецер» (1876), «Паляўнічы і ганчак» (1892), «Гальфстрым» (1899).

ХО́МІНГ (англ. homing ад home вяртацца дамоў), і н с т ы н к т д о м у,

здольнасць жывёл вяртацца са значнай адлегласці на сваё месца жыцця, нерасту, гнездавання і інш. Найб. развіты ў відаў з далёкімі сезоннымі міграцыямі: вугры, прахадныя ласасёвыя рыбы, марскія чарапахі, пералётныя птушкі, ластаногія. Напр., самцы марскога коціка кожны год з пачаткам сезона размнажэння знаходзяць сваю тэр. (дыям. каля 10 м) на пэўным пастаянным лежбішчы; альбатросы вяртаюцца ў свае гнёзды з адлегласці 2000—6600 км і інш. Як спадчынную прыкмету Х. выкарыстоўваюць у штучным адборы пры вывядзенні парод паштовых галубоў. Гл. таксама *Біянавігацыя*.

ХО́МІЧ Уладзімір Міхайлавіч (н. 24.1.1951, в. Кунаховічы Камянецкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. юрыст. Д-р юрыд. н. (1997); праф. (1998). Скончыў БДУ (1973) і працаваў у ім з 1976. З 2001 заг. кафедры, нам. дырэктара Ін-та перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі БДУ. Навук. працы па праблемах крымін. і крымін.-выканаўчага права.

Тв.: Уголовная ответственность за угон транспортных средств. Мн., 1982; Правовая концепция реализации (исполнения) мер уголовной ответственности в Республике Беларусь. Мн., 1996; Теоретические проблемы уголовной ответственности. Мн., 1997; Формы реализации уголовной ответственности. Мн., 1998.

ХОМС, горад на З Сірыі, у даліне р. Эль-Асі. Адм. ц. мухафазы Хомс. 481 тыс. ж. (1990). Вузел чыгунак і шашэйных дарог. Нафтаправоды з Ірака і радовішчаў Сірыі да партоў Баніяс і Тартус; прадуктаправоды на Дамаск, Халеб, Латакію. Прам-сць: нафтаперапрацоўчая, хім., цэментавая, цукр., тэкст.; пракат металаў. Гандл. цэнтр с.-г. раёна (садавіна, збожжа, жывёла). Рэшткі сярэдневяковых сцен, цытадэль, мячэць Нур-ад-дзіна (12 ст.) і інш.; рымскі царскі некропаль.

ХОМСК, вёска ў Драгічынскім р-не Брэсцкай вобл., каля аднайм. вадасховішча, на аўтадарозе Драгічын—Белаазёрск. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 18 км на Пн ад горада і чыг. ст. Драгічын, 128 км ад Брэста. 1155 ж., 394 двары (2003). Прадпрыемствы па разліве мінер. вады «Фрост» і перапрацоўцы бульбы (чыпсы). Сярэдняя і муз. школы, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Магілы ахвяр фашызму і камандзіра партыз. атрада Я.Г.Макарэвіча. Свята-Пакроўская царква (1990). У Х. ў 1798—1838 дзейнічала *Хомская суконная фабрыка*.

В.Ф.Хомчанка.

ХОМСК, вадасховішча ў Драгічынскім р-не Брэсцкай вобл., каля в. *Хомск*. Створана ў 1988. Пл. 0,8 км^2, даўж. 1,7 км, найб. шыр. 700 м, найб. глыб. 3,9 м, аб'ём вады 2,9 млн. м^3. Наліўное: вада падаецца з ручая Ласінцы і меліярац. канала. Ваганні ўзроўню вады на працягу года да 3,4 м. Выкарыстоўваецца для арашэння с.-г. угоддзяў і рыбагадоўлі.

ХО́МСКАЯ СУКО́ННАЯ ФА́БРЫКА. Дзейнічала ў 1798—1838 у мяст. Хомск Кобрынскага пав. (цяпер вёска ў Драгічынскім р-не Брэсцкай вобл.). У 1808 пастаўляла для арміі салдацкае сукно па 5 тыс. аршынаў за год. У 1828 ф-ка размяшчалася ў 13 мураваных і драўляных будынках. Мела паравую машыну, 12 стрыгальных, 35 прадзільных, 14 крэмплавальных, 2 шліхтавальныя, 4 кардавальныя, 54 ткацкія машыны, фарбавальню (9 катлоў), плывучы мост для мыцця воўны. Працавала каля 550 чал., выраблялі да 50 тыс. аршынаў за год тонкага сукна высокай якасці з уласнай воўны. Фарбу набывалі ў Пецярбургу і Рызе. На Усерасійскай прамысл. выстаўцы (Пецярбург, 1829) прадукцыя адзначана малым залатым медалём. У 1838 ф-ка пераведзена ў маёнтак *Альбярцін*.

У.Хомер. Спадарожны вецер. 1876.

ХО́МСКІ, Чомскі (Chomsky) Аўрам Ноам (н. 7.12.1928, г. Філадэльфія, ЗША), амерыканскі мовазнавец, палітолаг, публіцыст; заснавальнік генератыўнай лінгвістыкі. Маці паходзіць з г. Бабруйск Магілёўскай вобл. Чл. Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1963), Нац. АН ЗША (1972), чл.-кар. Брыт. акадэміі (1974). Д-р філасофіі (1955). Скончыў Пенсільванскі ун-т (1951). З 1951 у Гарвардскім ун-це, з 1955 у Масачусецкім тэхнал. ін-це (з 1961 праф.). Асн. працы па мовазнаўстве, кагнітыўнай псіхалогіі, філасофіі, гісторыі, паліталогіі, эканоміцы, міжнар. адносінах. Заклаў асновы тэорыі трансфармацыйных (генератыўных) граматык і фармальных моў як раздзела матэм. логікі (кн. «Трансфармацыйны аналіз», 1955; «Сінтаксічныя структуры», 1957), даў іх класіфікацыю (т.зв. іерархія Х.). Выступаў з ідэяй універсальнасці асн. («глыбінных») грамат. структур у розных мовах свету (кн. «Мова і мысленне», 1968). Стваральнік генератыўнай фаналогіі (1968, з М.Халле). Сфармуляваў (1995) «мінімалісцкую праграму» генератывізму.

Тв.: Рус. пер. — Язык и мышление. М., 1972; Аспекты теории синтаксиса. М., 1972; Логические основы лингвистической теории. М., 2002; Прибыль на людях: Неолиберализм и мировой порядок. М., 2002; Новый военный гуманизм: Уроки Косова. М., 2002.

Літ.: Barsky R.F. Noam Chomsky: A life of dissent. Cambridge, 1997; Литвинов В.П. Мышление Ноама Хомского. Тольятти, 1999. *М.М.Касцюковіч.*

ХО́МЧАНКА Васіль Фёдаравіч (12.1.1919, в. Канічы Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл. — 4.11.1992), бел. пісьменнік. Скончыў Ваен.-юрыд. акадэмію ў Маскве (1951). У 1937 рэпрэсіраваны і асуджаны на 4 гады пазбаўлення волі. Пакаранне адбываў у Ніжне-Амурскім лагеры. Вызвалены ў 1941. У 1941—68 у Сав. Арміі. Рэабілітаваны ў 1969. У 1972—85 заг. рэдакцыі выд-ва «Мастацкая літаратура». Друкаваўся з 1934. Пісаў на бел. і рус. мовах. Творы пераважна для дзяцей і юнацтва: зб-кі апавяданняў «Наша вячэра» (1959), «Рукавіцы генерала Даватара» (1960), «Аднойчы майскім днём» (1962), «Верны рыцар» (1965), «Сустрэча з цудам» (1969), «Уначы пад сонцам» (1974), «Паклон» (1976) і інш. Аповесць «Пры апазнанні затрымаць» (1983) пра жыццёвы і творчы шлях Ф.Багушэвіча. У кнізе аповесцей і апавяданняў «Цар — зэк Сямён Іваўкін» (1992) падзеі перыяду рэпрэсій. Аўтар рамана «Вяртанне ў агонь» (1978), зб-каў гумарэсак і апавяданняў «Паляванне на львоў» (1970), «Лёгкая рука» (1979), сцэнарыяў фільмаў маст. «Ветразі майго дзяцінства» (1982) і тэлевізійнага «Незнаёмая песня» (1983). Пераклаў на бел. мову казку Р.Кіплінга «Чаму ў слоніка доўгі нос», апавяданні лат. і літ. пісьменнікаў.

Тв.: Выбр. тв. Т. 1—2. Мн., 1979; Бацькава шабля: Аповесць і апавяданні. Мн., 1982; Чэкістам стала вядома: Аповесць, апавяданні. Мн., 1985; Стрэл у акно: Аповесці і апавяданні. Мн., 1988.

Літ.: Баруздин С. О Василии Хомченко // Баруздин С. Заметки о детской литературе. М., 1975; Навуменка І. Кніга адкрывае свет. Мн., 1978. *У.А.Жыжэнка.*

ХО́НДА, другая назва в-ва *Хонсю*.

«ХО́НДА», сям'я матацыклаў і легкавых аўтамабіляў кампаніі *«Хонда мотар»* і яе філіялаў. Матацыклы рознага прызначэння выпускаюцца з 1948, маюць ру-

Пяраднепрывадны аўтамабіль **«Хонда»** мадэлі «Леджэнд Коўп».

хавікі магутнасцю 3—90 кВт, найб. скорасць да 235 км/гадз. Пяраднепрывадныя легкавыя аўтамабілі розных класаў выпускаюцца з 1960, маюць 2-, 4- ці 5-месны (мікрааўтобусы — 6-месныя) кузаў, пераважна хэтчбэк, купэ ці седан, бензінавы рухавік магутнасцю 60—201 кВт, размешчаны пераважна спераду, найб. скорасць да 270 км/гадз.

«ХО́НДА МО́ТАР», буйная японская кампанія, якая выпускае легкавыя аўтамабілі, матацыклы, спец. тэхніку і рухавікі, а таксама распрацоўвае тэхн. навіны ў аэранаўтыцы і навігацыйных сістэмах. Засн. ў 1946 інжынерам Суіціра Хонда як Ін-т тэхн. даследаванняў, пераўтвораны ў 1948 у кампанію. Штаб-кватэра ў Токіо. Кампанія займае 1-е месца ў свеце па вытв-сці рухавікоў і матацыклаў. Мае 437 падраздзяленняў і даччыных кампаній у свеце, 109 вытв. прадпрыемстваў у 29 краінах. На асн. вытв. прадпрыемствах занята больш за 61 тыс. чалавек. Размеркаваннем, размяшчэннем і продажам прадукцыі «Х.М.» на Беларусі займаецца кампанія «Парытэт сэрвіс». *М.Б.Жукава.*

ХОНДРАПРАТЭІ́ДЫ (ад грэч. chondros храсток + *пратэіды*), хондрамукапратэіды, хондрамукоіды, бялкі (протэагліканы, мукапратэіды), што ўваходзяць у састаў асн. рэчыва розных відаў злучальнай тканкі. У злучальнай тканцы ўтвараюць буйныя агрэгаты. Найб. колькасць Х. у храстковай тканцы, дзе яны выпрацоўваюцца храстковымі клеткамі. У залежнасці ад утрымання Х. адрозніваюць гіялінавую, эластычную і калагенавалакністую храстковую тканку. Х. вызначаюць біямех. ўласцівасці злучальнай тканкі (трываласць на выгіб, скручванне, расцяжэнне), удзельнічаюць у працэсах рэгенерацыі і інш. *І.М.Семяненя, А.Р.Давыдоўскі.*

М. дэ **Хондэкутэр**. Свойскія птушкі.

ХО́НДЭКУТЭР (Hondecoeter) Мельхіяр дэ (1636, г. Утрэхт, Нідэрланды — 3.4.1696), галандскі жывапісец; адзін з вядучых прадстаўнікоў галандскага *анімалістычнага жанру*. З 1659 працаваў у Гаазе, з 1663 у Амстэрдаме. Пад уплывам майстроў фламандскага нацюрморта адлюстроўваў пераважна «птушыныя дворы», пісаў карціны з выявамі розных відаў хатніх, дзікіх або экзатычна-дэкар. птушак: «Птушкі ў парку», «Свойскія птушкі». Творы вылучаюцца барочнай пабудовай кампазіцыі, дэкаратыўнасцю каларыту. Пісаў таксама нацюрморты з бітай дзічынай.

ХО́НЕКЕР (Honecker) Эрых (25.8.1912, г. Нойнкірхен, Германія — 29.5.1994), партыйны і дзярж. дзеяч ГДР. З 1929 чл. Камуніст. партыі Германіі, з 1931 сакратар Саарскага акруговага к-та Камуніст. саюза моладзі (КСМ) Германіі, з 1934 чл. ЦК КСМ. Пасля прыходу да ўлады нацыстаў (1933) у падполлі, у 1935—45 зняволены. У 1946—55 старшыня Цэнтр. савета Саюза свабоднай ням. моладзі. З 1946 чл. ЦК КПГ, потым Цэнтр. праўлення, ЦК Сацыяліст. адзінай партыі Германіі (САПГ). З 1950 канд., з 1958 чл. Палітбюро ЦК САПГ. З 1958 сакратар, з 1971 1-ы сакратар, у 1976—89 ген. сакратар ЦК САПГ. У 1971—89 старшыня Нац. савета абароны, у 1976—89 старшыня Дзярж. Савета ГДР. Не прыняў сав. палітыку перабудовы. Пад націскам Палітбюро 18.10.1989 выйшаў у адстаўку. 3.12.1989 выключаны з чл. САПГ. Абвінавачаны ў злоўжываннях і карупцыі. Судовага разбору пазбег дзякуючы пераезду ў Маскву (сак. 1991), але паводле патрабавання ўрада ФРГ 29.7.1992 вернуты ў Германію і зняволены. Судовы працэс над Х. спынены 12.11.1992 з-за яго цяжкай хваробы. Са студз. 1993 жыў у Чылі.

Тв.: Рус. пер. — Из моей жизни. М., 1982.
Літ.: Lorenzen. Erich Honecker. Hamburg, 2001; Kunze. Staatschef a. D. Berlin, 2001. *М.Г.Жаркоў.*

ХО́НСЮ, Хонда, самы вялікі в-аў Японскага архіпелага, паміж Ціхім ак. і Японскім морам. Пл. 230,4 тыс. км^2 (з

Востраў **Хонсю**. Гара Фудзіяма.

прылеглымі астравамі 231 тыс. км^2), даўж. больш за 1400 км. На Х. жыве каля 80% насельніцтва Японіі. У рэльефе пераважаюць нізкія і сярэдневышынныя горы выш. 1500—2000 м (хр. Оу, Хіда, Кісо, Акаісі і інш.). Найб. высокія хрыбты (т.зв. Японскія Альпы) укрыты снежнікамі, маюць формы альпійскага рэльефу. Каля 20 дзеючых вулканаў, у т.л. *Фудзіяма*, і шмат патухлых. Частыя землетрасенні (катастрафічнае Такійскае ў 1923). Невял. прыбярэжныя раўніны (Канто, Нобі і інш.). Клімат акіянічны мусонны, на Пн умераны, на Пд субтрапічны. Восенню звычайна бываюць тайфуны. У гарах на Пн шыракалістыя лясы, участкі тайгі; на Пд — субтрапічныя (вечназялёныя і хвойныя) лясы. Нац. паркі — Бандай-Асахі, Ніко, Фудзі-Хаконе-Ідзу і інш. Раўніны разараны і густа населены. Гал. гарады: Токіо, Осака, Нагоя, Кіёта, Іакагама, Кобе. Пра гаспадарку гл. ў арт. *Японія*.

Г. ван **Хонтхарст**. Канцэрт. 1624.

ХО́НТХАРСТ (Honthorst) Герыт (Герард) ван (4.11.1590, г. Утрэхт, Нідэрланды — 27.4.1656), галандскі мастак. Вучыўся ва Утрэхце ў А.Блумарта, у 1610 або ў 1612—20 працаваў у Італіі, дзе зазнаў уплыў М.*Караваджа*. Майстар т.зв. утрэхцкага *караваджызму*. Пісаў інтымныя жанравыя сцэны і трактаваныя як быт. біблейскія кампазіцыі, пабудаваныя на эфектах штучнага начнога асвятлення. Вытанчаны каларыт, мяккасць святлоценявых кантрастаў уласцівы кампазіцыям «Пакланенне пастухоў» (1622), «Канцэрт» (1624), «Музыкант», «Дзяцінства Хрыста».

ХО́ПКІНС, Гопкінс (Hopkins) Фрэдэрык Гоўленд (20.6.1861, г. Істбарн, Вялікабрытанія — 16.5.1947), англійскі вучоны ў галіне біяхіміі; адзін з заснавальнікаў вітаміналогіі. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (з 1905, у 1930—35 яго прэзідэнт). Замежны ганаровы чл. АН СССР (1934). Скончыў Лонданскі ун-т (1894), дзе і працаваў. З 1898 у Кембрыджскім ун-це (з 1914 праф.). Навук. працы па біяхіміі азоцістага абмену ў арганізме. Адкрыў трыптафан (1901), у складзе малака — вітаміны (A і D), што стымулююць рост, глутатыён (1921). Сфармуляваў палажэнне аб незаменных фактарах харчавання — незаменных амінакіслотах (1906). Нобелеўская прэмія 1929 (з Х.*Эйкманам*).

В.Ф.Ермакоў.

Ф.Г.**Хопкінс**.

ХОР (ад грэч. choros), 1) у антычным тэатры — група выканаўцаў, што выступала ў трагедыях і камедыях як адзіная зборная дзейная асоба — каментатар падзей. 2) Калектыў спевакоў, які выконвае вак.-хар. твор з суправаджэннем ці *а капэла*. У залежнасці ад манеры выканання ці кірунку бываюць акад. (часта наз. *капэламі*), нар., ансамблі песні і танца, хар. калектывы ў трупах муз. т-раў. Паводле тыпу падзяляюцца на мяшаныя (поўнага складу — сапрана, альт, тэнар, бас; няпоўнага — без адной з партый) і аднародныя (мужчынскія, жаночыя, дзіцячыя). Склад Х. можа быць малым (больш за 12 чал.), сярэднім (больш за 50 чал.), вял. (да 120 чал.). Зводныя Х. дасягаюць 30 тыс. чал.

На Беларусі хар. выканальніцтва мае даўнія традыцыі. З канца 10 ст. прафес. хар. спевы культываваліся пераважна як царкоўныя; з'явіўся *знаменны спеў*, які быў гал. у прафес. музыцы да 17 ст. З канца 15 ст. пашырылася кантавая культура, з 2-й пал. 16 ст. — *партэсныя спевы* без муз. суправаджэння, гал. жанрам якіх быў духоўны канцэрт. Станаўленню партэсных спеваў садзейнічала падрыхтоўка спевакоў у манастырскіх і брацкіх школах. У 1630-я г. ў Магілёўскім брацтве існаваў мяшаны 4-галосн хор, у 18 ст. — 1-й пал. 19 ст. пры магнацкіх дварах у Нясвіжы, Слуцку, Слоніме, Гродне, Шклове, Магілёве і інш. вядомы аркестры і Х. (капэлы), якія суправаджалі спектаклі, балі, службы. У 1830—40-я г. свецкае музіцыраванне развівалася ў прыватных муз. школах. У бел. операх С.Манюшкі «Рэкруцкі набор» (паст. 1841), «Ідылія» («Сялянка»; паст. 1852; усе з К.Кжыжаноўскім) значнае месца адведзена Х. Пасля 1907 у многіх гарадах Беларусі адкрыліся пеўча-рэгенцкія курсы. У 1914 У.Тэраўскі стварыў гар. хор, які пазней выступаў на сцэне «Беларускай хаткі» ў Мінску (з 1917 Бел. нар. хор). У 1918 пачаў працаваць Дзярж. хор пад кіраўніцтвам М.Анцава ў Віцебску; у 1920-я г. — Х. Галоўпалітасветы пад кіраўніцтвам В.Яфімава. Па ініцыятыве Інбелкульта створаны Бел. студыйны хор пад кіраўніцтвам А.Ягорава (1926; у 1928—30 *Беларуская дзяржаўная капэла*).

Сярод сучасных Х. на Беларусі: *Хор акадэмічны Беларускага тэлебачання і радыё*, *Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла Рэспублікі Беларусь* імя Р.Шырмы, *Дзяржаўны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь* імя Г.Цітовіча, Х. *Ансамбля песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь*, Х. Нац. акад. опернага т-ра Беларусі, камерны Х. Гомельскай абл. філармоніі і інш. Дзейнічаюць таксама самадз. Х. акад. і нар. плана (гл. ў арт. *Народныя хары, ансамблі, аркестры*). 3) Муз. твор для хар. выканання. У творчасці бел. кампазітараў развіваецца з 1920-х г. (М.Аладаў, У.Алоўнікаў, А.Багатыроў, Л.Захлеўны, І.Кузняцоў, І.Лучанок, А.Мдывані, Р.Пукст, Ю.Семяняка, Дз.Смольскі, А.Туранкоў, Э.Тырманд, М.Чуркін, Л.Шлег і інш.). Гл. таксама *Харавая музыка*. 4) Стараж. назва групы аднародных муз. інструментаў (Х. духавых медных, Х. віяланчэляў, Х. лютняў і інш.). 5) Група настроеных ва унісон струн аднаго муз. інструмента (лютні, мандаліны, цымбалаў і інш.) для ўзмацнення ці тэмбравага ўзбагачэння гуку. 6) У раннехрысціянскіх цэрквах месца перад *алтаром*, прызначанае для пеўчых (гл. *Хоры*).

Літ.: Чесноков П.Г. Хор и управление им. 3 изд. М., 1961; Гісторыя беларускай савецкай музыкі. Мн., 1971; Хоровая полифония. Мн., 1981.

Т.Г.Слабодчыкава.

...ХОР, гл. *...Харыя*.

ХО́Р АКАДЭМІ́ЧНЫ БЕЛАРУ́СКАГА ТЭЛЕБА́ЧАННЯ І РА́ДЫЁ, Заслужаны акадэмічны хор Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь. Створаны ў 1931 пры Бел. радыёцэнтры з б. удзельнікаў *Беларускай дзяржаўнай капэлы*, Бел. нар. хору і выпускнікоў Бел. муз. тэхнікума. У 1940 аб'яднаны з *Харавой капэлай Беларускай філармоніі*. З 1990 акадэмічны. З 2001 заслужаны. У даваен. час прапагандаваў бел. нар. песен-

ную творчасць, творы бел. кампазітараў, садзейнічаў стварэнню нац. хар. рэпертуару. У розны час хорам кіравалі М.*Маслаў* (1940—41), Л.Бен (з 1944), Р.*Пукст* (з 1949), І.Кліёнскі (хормайстар, 1949—79), А.Зелянкова (1950—63), з 1965 маст. кіраўнік і гал. дырыжор В.*Роўда*. Выканальніцкая манера калектыву адметная спалучэннем народнасці і акадэмізму, уменнем дасягаць яркай вобразнасці, захоўваць стыль і эпоху муз. твора. У рэпертуары творы сусв. хар. музыкі, у т.л. беларускай. Ажыццявіў фондавы запіс многіх (больш за 2000) сцэн., кантатна-араторыяльных і хар. твораў бел. кампазітараў, апрацовак бел. нар. песень, у т.л. змешчаных у анталогіі «Беларускія народныя песні (для хору)» Р.Шырмы (т. 1—2, 1971—73) і інш. Сярод салістаў: Л.*Каспорская*, В.*Прышчапёнак*, Л.*Кудзеля*, Я.Кідуль, А.Лапіцкая, Р.Шытава, Н.Ясева і інш. Дзярж. прэмія Беларусі 1990.

Літ.: Романовская Л.А. Хор Белорусского телевидения и радио. Мн., 1975.

Л.А.Шымановіч.

Хор акадэмічны Беларускага тэлебачання і радыё.

ХОР БЕЛАРУ́СКАГА СТУДЭ́НЦКАГА САЮ́ЗА ў Вільні. Існаваў у 1931—39 пры *Беларускім студэнцкім Саюзе* Віленскага ун-та. Стваральнік і кіраўнік Р.*Шырма*. У складзе хору студэнты, рабочая і вучнёўская моладзь. Дзейнасць па прапагандзе бел. нац. рэпертуару мела вял. культ. і паліт. значэнне. Хор выступаў з сольнымі канцэртамі ў гар. парках Вільні, гуртку Т-ва бел. школы, у Віленскай бел. гімназіі і інш. У рэпертуар уваходзілі бел. нар. песні ў апрацоўках М.Аладава, М.Анцава, М.Гайваронскага, К.Галкоўскага, М.Равенскага, Л.Рагоўскага, Ф.Уладзімірскага і інш. на вершы бел. паэтаў, а таксама ўкр. і польскія нар. песні, творы рас. кампазітараў. На творчае аблічча і характар дзейнасці хору вял. ўплыў зрабіла фальклярыстычна-збіральніцкая праца Шырмы.

ХО́РАВА Святлана Аляксееўна (н. 5.1.1943, г. Ішым Цюменскай вобл., Расія), расійскі і бел. вучоны ў галіне фізіялогіі. Д-р н. (1992), праф. (1995). Скончыла Томскі ун-т (1965). З 1968 у Ін-це біялогіі і біяфізікі Томскага ун-та (з 1992 нам. дырэктара), з 1996 у Бел. Нац. тэхн. ун-це. Навук. працы па праблемах індывід. устойлівасці арганізма да ўздзеяння фактараў навакольнага асяроддзя і павышэння рэзістэнтнасці праз рэгуляцыю асн. жыццёвых функцый.

Тв.: Нейрогуморальная регуляция процессов срочной адаптации организма. Томск, 1993 (разам з М.А.Мядзведзевым); Natural and nuclear anomalies and life protection. Vilnius, 1998 (у сааўт.).

ХО́РАВІТЦ (Horowitz) Скот (н. 24.3.1957, г. Філадэльфія, ЗША), касманаўт ЗША. Д-р н. па аэранаўтыцы (1982). Скончыў Каліфарнійскі ун-т (1978), тэхнал. ін-т (штат Джорджыя, 1979). З 1992 у групе касманаўтаў НАСА. Здзейсніў 4 палёты ў складзе экіпажаў касм. караблёў (КК): 22.2—9.3.1996 — на КК «Калумбія», 11—21.2.1997 — на КК «Дыскаверы», 19—29.5.2000 — на КК «Атлантыс» (як пілот) па праграме работ з Міжнар. касм. станцыяй (МКС), 10—22.8.2001 — на КК «Дыскаверы» (як камандзір) па праграме работ з МКС. У космасе правёў 47,4 сут. 4 медалі НАСА «За касмічны палёт». *У.С.Ларыёнаў.*

ХО́РАПУЦЬ, рака ў Добрушскім р-не Гомельскай вобл., левы прыток р. Іпуць (бас. р. Дняпро). Даўж. 45 км. Пл. вадазбору 528 км^2. Цячэ па Гомельскім Палессі, пачынаецца за 2 км на ПдЗ ад в. Чырвоны Арол, вусце на зах. ускраіне г. Добруш. Даліна трапецападобная, у вусці зліваецца з далінай р. Іпуць. Пойма пераважна лугавая. Рэчышча каналізаванае на ўсім працягу, шыр. 2—3 м у вярхоўі, у вусці да 12 м. Берагі стромкія, выш. да 1,2 м. Асн. прытокі: Гразліўка (справа) і Чачора (злева). Прымае сцёк з меліярац. каналаў.

ХО́РАСТАВА, вёска ў Салігорскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 49 км ад горада і чыг. ст. Салігорск, 180 км ад Мінска. 917 ж., 291 двор (2003). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла партызан. Магілы ахвяр фашызму. Помнік В.З.*Каржу*. Свята-Пакроўская царква (1990).

ХО́РДА (ад грэч. chordē струна), спінная струна, спінны цяж, эластычная несегментаваная шкілетная вось у *хордавых* жывёл. У ланцэтніка, кругларотых, некат. рыб (асятровых, дваякадыхальных, суцэльнагаловых) захоўваецца ўсё жыццё, у астатніх пазваночных і абалоннікаў — толькі ў эмбрыёнаў; у дарослых пазваночных развіваюцца храстковыя або касцявыя элементы пазванкоў і Х. замяшчаецца *пазваночнікам*.

ХО́РДАВЫЯ (Chordata), вышэйшы тып шматклетачных жывёл. З падтыпы: галавахордавыя, або цэфалахордавыя (Cephalochordata), *абалоннікі*, ці лічынкавахордавыя, і *пазваночныя*, або чарапныя. Каля 40 тыс. сучасных відаў, з іх каля 38 тыс. пазваночных. Пашыраны ўсюды. На Беларусі прадстаўлены пазваночнымі.

Для Х. характэрны восевы шкілет у выглядзе *хорды*. У адных арганізмаў хорда бывае толькі на ранніх стадыях развіцця, у другіх — усё жыццё. Амаль ва ўсіх Х. на працягу жыцця над хордай захоўваецца спінная нерв. парожняя трубка, з якой дыферэнцыруюцца спінны і галаўны мозг. У пярэднім аддзеле кішэчніка — жаберныя шчыліны, якія застаюцца на ўсё жыццё ці бываюць на пэўнай стадыі развіцця. Сэрца на брушным баку над стрававальнай трубкай. Усе Х. маюць другасны рот і поласць цела (цэлом), метамерную будову гал. сістэм органаў і двухбаковую (білатэральную) сіметрыю цела.

Літ.: Малахов В.В. Новый взгляд на происхождение хордовых // Природа. 1982. № 5; Жизнь животных. Т. 1—7. 2 изд. М., 1987—89.

ХОРМА́ЙСТАР (ад *хор* + ням. Meister майстар, кіраўнік), харавы дырыжор, кіраўнік хору.

ХО́РНБАСТЭЛЬ (Hornbostel) Эрых Морыц фон (25.2.1877, Вена — 28.11.1935), аўстрыйскі музыказнавец, педагог; адзін з заснавальнікаў этнамузыкалогіі. Вучань, потым асістэнт К.Штумпфа ў Ін-це псіхалогіі пры Берлінскім ун-це імя В.Гумбальта (з 1917 праф. гэтага ун-та). З 1906 кіраўнік Берлінскага фонаграм-архіва. З 1933 у ЗША. Аўтар навук. прац па яп., інд., араб., афр. і інш. музыку, а таксама па сістэматыцы муз. інструментаў, муз. акустыцы і псіхалогіі. Сярод вучняў Г.Д.*Каўэл*.

ХО́РНІ (Horney) Карэн (1885, г. Гамбург, Германія — 1952), нямецкі і амерыканскі псіхолаг і псіхапатолаг; адна з заснавальнікаў *неафрэйдызму*. Скончыла Фрайбургскі ун-т. З 1913 вяла мед. практыку, вывучала *псіхааналіз* у Берлінскім псіхааналіт. ін-це. З 1932 у ЗША, працавала ў Чыкагскім і Нью-Йоркскім псіхааналіт. ін-тах. У працах «Неўратычная асоба нашага часу» (1937), «Новыя шляхі ў псіхааналізе» (1939), «Самааналіз» (1942), «Нашы ўнутраныя канфлікты» (1945), «Неўрозы і развіццё чалавека» (1950) і інш. крытычна перапрацавала шэраг палажэнняў вучэння З.Фрэйда (аб інстынктах, тэорыю лібіда, канцэпцыі бессвядомага, неўрозаў, Эдыпава комплексу і інш.) і ажыццявіў

ла сацыялагізацыю псіхааналізу і фрэйдызму. Падкрэслівала ўплыў культуры на бессвядомае, сац.-культ. параджэнне неўрозаў і ўнутрыасобасных канфліктаў, гіст. зменлівасць неўрозаў і інш. Неўрозы трактавала як неадэкватныя формы паводзін у варожым асяроддзі.

«ХО́РНУНГ» («Hornung», «Л ю т ы»), кодавая назва карнай аперацыі ням. фашыстаў супраць партызан і насельніцтва ў Ганцавіцкім, Жыткавіцкім, Чырвонаслабодскім, Ленінскім, Лунінецкім, Ляхавіцкім, Слуцкім, Старобінскім р-нах, на тэр. партыз. злучэнняў Пінскага і Слуцкай зоны ў лютым 1943 у Вял. Айч. вайну. Праводзілася сіламі 3 паліцэйскіх палкоў і 5 батальёнаў, у т.л. асобым батальёнам СС Дырлевангера. Партызаны стварылі штаб (камандзір В.З.*Корж*), на чале з якім некалькі дзён стрымлівалі націск гітлераўцаў, потым асн. сілы партызан выйшлі з-пад удараў праціўніка. У час аперацыі здзейснілі подзвіг браты І. і М. *Цубы*. Карнікі ўчынілі масавае знішчэнне грамадзян у Слуцку, потым пачалі прачэсваць міжрэчча Случ—Морач—Цна і спалілі шэраг вёсак з жыхарамі. У выніку аперацыі карнікі загубілі больш за 10 тыс. грамадзян, захапілі 16 700 галоў жывёлы, 222,8 т збожжа і інш.

ХОРС, адзін з язычніцкіх багоў усх. славян. Упамінаецца пад 980 у «Аповесці мінулых гадоў». У «Слове аб паходзе Ігаравым» наз. «велики Хърс» (г.зн. самы шаноўны). Верагодна, Х. лічылі адным з божышчаў Сонца, апекуном земляробства. Ідал Х. разам з інш. быў пастаўлены кн. Уладзімірам Святаславічам у Кіеве каля яго «двара церамнага». З пашырэннем хрысціянства культ Х. знік і не пакінуў слядоў у нар. вераваннях і фальклоры.

ХО́РЦІ (Horthy) Міклаш (18.6.1868, г. Кендэрэш, Венгрыя — 9.2.1957), дзяржаўны дзеяч Венгрыі. Контр-адм. (1918). Скончыў ваен.-марскую акадэмію ў г. Фіуме (цяпер Рыека ў Харваты), служыў у ВМФ Аўстра-Венгрыі. У 1-ю сусв. вайну камандаваў крэйсерам, ВМФ (з 1918); у 1918 падавіў паўстанне ваен. маракоў у порце Котар (цяпер у Чарнагорыі). З 1919 ваен. міністр венг. ўрада ў г. Сегед, галоўнакаманд. нац. арміяй, якая дзейнічала супраць Венг. Сав. Рэспублікі. Пасля яе падзення праводзіў белы тэрор. З 1.3.1920 рэгент (правіцель) Венг. каралеўства (якое не мела караля). Устанавіў аўтарытарны рэжым, у знешняй палітыцы з 1930-х г. арыентаваўся на фаш. Германію, на баку якой Венгрыя ўдзельнічала (з 1941) у вайне супраць СССР. Аднак у 1944 намагаўся заключыць перамір'е з СССР, шукаў кантакты з ЗША і Вялікабрытаніяй, за што ў кастр. 1944 скінуты ням. і мясц. фашыстамі (гл. *Нілашысты*) і інтэрніраваны ў Баварыі. З 1949 жыў у Партугаліі.

ХО́РЫ (ад грэч. choros хор) у а р х і т э к т у р ы, верхняя (на ўзроўні 2-га яруса) адкрытая галерэя ў інтэр'ерах храмаў, парадных залаў і інш. Размешчаны звычайна з зах. боку храма ці апяразваюць *неф* з паўд., зах. і паўн. бакоў. У сярэдневякоўі Х. прызначаліся для прадстаўнікоў вышэйшых слаёў грамадства, пазней на іх размяшчаліся музыканты, пеўчыя, арган. У хрысц. базіліках, раманскіх і гатычных храмах 13—15 ст. Х. — агароджаная балюстрадай галерэя паміж нефам і *прэсбітэрыем* насупраць гал. алтара. З сярэдзіны 15 ст. Х. размяшчалі пры ўваходзе ў храм, у правасл. храмах — над *бабінцам*. У пабудовах стылю класіцызму Х. мелі выгляд каланады, завершанай антаблементам і атыкавай сцяной.

ХО́СПІС (англ. hospice багадзельня ад лац. hospitium гасціннасць), 1) спецыяльная клініка для безнадзейна хворых, дзе іх акружаюць увагай, клопатам і аказваюць пэўную мед. дапамогу; прытулак, багадзельня. 2) Заезны дом накшталт гасцініцы, які ўтрымліваецца хрысц. абшчынамі або манахамі.

ХО́СТА, курортны пасёлак на Чарнаморскім узбярэжжы Каўказа. З 1961 у складзе курорта *Сочы* (там жа гл. характарыстыку клімату). Мінер. крыніцы сульфідных і ёдабромных вод. Лечаць захворванні органаў кровазвароту, апоры і руху, нерв. сістэмы.

Хоры Сафійскага сабора ў г. Полацк Віцебскай вобл.

ХО́ТАМЕЛЬ, група археал. помнікаў раннеславянскага часу (7—10 ст.) — гарадзішча, селішча, бескурганны могільнік — каля в. Хотамель Столінскага р-на Брэсцкай вобл. Г а р а д з і ш ч а авальнай формы, умацавана валамі і ровам (захаваліся з зах. і ўсх. бакоў). Даследавалі Р.Якімовіч (1937), Б.В.Міралюбаў (1953), Ю.У.Кухарэнка (1954—57), І.П.Русанава (1964). Выяўлены рэшткі агнішчаў і слупавых ям, знойдзены ляпная і ганчарная кераміка, металічныя наканечнікі стрэл і дзідаў, сярэбраныя скроневыя кольцы і фрагмент бранзалета з пашыранымі канцамі, жал. спражка, пласціны даспехаў і інш. Гарадзішча не было заселена, з'яўлялася сховішчам, пазней — грамадскім цэнтрам, месцам сходаў. На с е л і ш ч ы (знаходзіцца на У і З ад гарадзішча, пл. 5—6 га) выяўлены рэшткі прамавугольных паўзямлянкавых жытлаў, знойдзены ляпная кераміка, ганчарны посуд, жал. нажы, сярпы, долаты, тачыльныя брускі, гліняныя і шыферныя прасліцы, рыбалоўныя восці. Б е с к у р г а н н ы м о г і л ь н і к з пахавальным абрадам трупаспалення. Х. — адзін з першых раннеслав. помнікаў 2-й пал. 1-га тыс. н.э., даследаваных на Пд Беларусі і ПнЗ Украіны. Выкарыстоўваецца як эталон для датавання інш. археал. аб'ектаў.

В.С.Вяргей.

ХО́ТАРН, Г о т а р н (Hawthorne) Натаніэл (4.7.1804, г. Сейлем, штат Масачусетс, ЗША — 19.5.1864), амерыканскі пісьменнік, прадстаўнік амер. рамантызму. Скончыў Бодайнскі каледж (1825). На яго творчасць значна паўплывалі *трансцэндэнталісты*. Майстар псіхал. і алегарычных аповесцей і апавяданняў (зб-кі «Двойчы расказаныя гісторыі», 1837, 1842; «Легенды старога двара», 1846) пра пошукі прыгажосці, амер. даўніны, цяжкасці духоўнага самапазнання. Пурытанскія традыцыі паўплывалі на праблематыку сумлення і граху, духоўнасці і фанатызму, дабра і зла ў раманах «Пунсовая літара» (1850, экранізаваны ў 1972) і «Дом з сямю шпілямі» (1851). Аўтар «Рамана пра Блайтдэйл» (1852), рамана «Мармуровы фаўн» (1860), кніг апавяданняў і казак для дзяцей «Дзядулева крэсла» (1841), нарысаў «Наша старая радзіма» (1863), нататак, біяграфій гіст. асоб і інш. Яго творы адметныя рытмічнасцю мовы, дыдактычнай скіраванасцю, спалучэннем рэальна-канкрэтнага з умоўна-фантаст., насычаны сімваламі і алегорыямі.

Тв.: Рус. пер. — Новеллы. М.; Л., 1965; Избр. произв. Т. 1—2. Л., 1982.

Е.А.Лявонава.

ХО́ТЛІНСКАЕ ВО́ЗЕРА. У Чашніцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Ула, каля в. Хотліна, за 18 км на ПдУ ад г. Чашнікі. Пл. 0,23 км^2, даўж. 1,31 км, найб. шыр. 320 м, найб. глыб. 4,9 м, даўж. берагавой лініі 4,4 км. Пл. вадазбору 97 км^2. Катлавіна лагчыннага тыпу, выцягнута з Пн на Пд. Схілы катлавіны на Пд і ПдУ выш. 15—20 м (на З 4—6 м), разараныя, на ПдУ пад лесам. Берагі нізкія, пясчаныя, зараслі воднабалотнай расліннасцю і хмызняком, месцамі сплавінныя. Мелкаводдзе вузкае, пясчанае, глыбей дно ілістае. Зарастае да глыб. 2,2 м. Праз возера цячэ р. Свяча, якая на Пн злучае яго з воз. Маеўскае.

ХО́У (Howe) Гордан (Гордзі) (н. 31.3.1928, Флорэл, Канада), канадскі і амер. спартсмен (хакей з шайбай). З 1944 у ЗША. Нападаючы клуба Нац. ха-

кейнай лігі (НХЛ) «Дэтройт Рэд Уінгз» (1946—71). Віцэ-прэзідэнт (з 1971), прэзідэнт (з 1973) клуба Сусв. хакейнай асацыяцыі (СХА) «Х'юстан Аэраз», выступаў за гэты клуб у 1973—77; за «Нью Інглэнд Уэлерс» (СХА) — у 1978—80. За ўсю спарт. кар'еру згуляў у 2421 матчы, забіў 1071 шайбу. Чэмпіён НХЛ (1949—55, 1957, 1965), уладальнік Кубка Стэнлі (1950, 1952, 1954, 1955) — гал. прыза сезонаў у НХЛ. Лепшы спартсмен Канады (1963). З 1980 займаецца трэнерска-адм. і прадпрымальніцкай дзейнасцю. *А.М.Петрыкаў.*

ХО́ЎАРД, Говард (Howard) Эбінізер (29.1.1850, Лондан — 1.5.1928), англійскі тэарэтык горадабудаўніцтва, сацыёлаг. У 1872—77 жыў у Нью-Йорку. Зазнаў уплыў утапічнага сацыялізму. Выступіў з ідэяй стварэння першых гарадоў-садоў у Вялікабрытаніі: Лечуарта (1902—03) і Уэлін-Гардэн-Сіці (1920). Заснавальнік Асацыяцыі гарадоў-садоў (1899).

ХО́ЎАРС, Гэварт (Haworth) Уолтэр Нормен (19.3.1883, Чорлі, Вялікабрытанія — 19.3.1950), англійскі хімік-арганік і біяхімік. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1928). Скончыў Гётынгенскі (1910) і Манчэстэрскі (1911) ун-ты. З 1912 праф. ун-та Сент-Андрус, з 1920 — Армстранг-каледжа ў Ньюкасле, у 1925—48 — Бірмінгемскага ун-та. Навук. працы па хіміі вугляводаў. Удасканаліў наменклатуру цукроў. Ажыццявіў сінтэз вітаміну С (1933). У 2-ю сусв. вайну ўдзельнічаў у распрацоўках, звязаных з выкарыстаннем ат. энергіі. Нобелеўская прэмія 1937 (з П.*Карэрам*).

У.Н.**Хоўарс**.

ХОЎ ТУ, у кітайскай міфалогіі бог зямлі. Лічыўся прапраўнукам сонечнага бога Яньдзі. Яго шанавалі як уладара бакоў свету і правіцеля сталіцы змроку ў замагільным свеце. У пазнейшыя часы Х.Т. ўспрымаўся як жаночае бажаство з тытулам «матуля».

ХО́ЎХЛАВА, вёска ў Маладзечанскім р-не Мінскай вобл., на аўтадарозе Маладзечна—Хажова—Валожын. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 23 км на Пд ад горада і чыг. ст. Маладзечна, 82 км ад Мінска. 435 ж., 160 двароў (2003). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Мемарыяльная дошка С.*Буднаму*. Помнікі архітэктуры: касцёл Дзевы Марыі і капліца (2-я пал. 18 ст.).

ХО́ФМАН (Hoffmann) Джэфры (н. 1944, Нью-Йорк), касманаўт ЗША. Д-р н. у галіне астрафізікі (1971). Скончыў Гарвардскі ун-т (1971). Працаваў у НАСА. У 1978—97 у групе касманаўтаў НАСА. Здзейсніў 5 палётаў (як спецыяліст па аперацыях на арбіце) у складзе экіпажаў касм. караблёў (КК): 12—19.4.1985 — на КК «Дыскаверы», 2—11.12.1990 і 22.2—9.3.1996 — на КК «Калумбія», 31.7—8.8.1992 — на КК «Атлантыс», 2—12.12.1993 — на КК «Індэвар». У космасе правёў 50,9 сут. 5 медалёў НАСА «За касмічны палёт». *У.С.Ларыёнаў.*

ХО́ФМАН, Гофман (Hoffmann) Іозеф (15.12.1870, Бртніцэ, Чэхія — 7.5.1956), аўстрыйскі архітэктар; прадстаўнік стылю мадэрн. Вучыўся ў Венскай маст.-прамысл. школе ў К.Газенаўэра і О.*Вагнера*. Адзін са стваральнікаў аб'яднанняў «Венскі Сецэсіён» (1897), «Венскія майстэрні» (1903), «Аўстрыйскі Веркбунд» (1912). Пошукамі рацыянальнай прастаты і яснасці форм спрыяў станаўленню архітэктуры *функцыяналізму*. Пабудовы: санаторый у Пуркерсдорфе каля Вены (1903—04), Палац Стокле ў Бруселі (1905—11), аўстр. павільёны на многіх выстаўках, у т.л. Веркбунда ў Кёльне (Германія, 1914), біенале ў Венецыі (Італія, 1934).

І.**Хофман**. Палац Стокле ў Бруселі. 1905—11.

Э.**Хоўард**. Горад-сад Лечуарта (Вялікабрытанія). Панарама.

ХО́ФМАН (Hoffmann) Роалд (н. 18.7.1937, г. Злочаў, Польшча), амерыканскі фізікахімік. Чл. Нац. АН ЗША (з 1972). Скончыў Калумбійскі ун-т (1958). Да 1965 у Гарвардскім, з 1965 у Корнелскім ун-тах (з 1968 праф.). Навук. працы па хім. кінетыцы і вывучэнні механізму хім. рэакцый. Разам з Р.Б.*Вудвардам* выявіў заканамернасці прадказання рэакцыйнай здольнасці арган. злучэння

(правіла Вудварда — Х.; 1965). Нобелеўская прэмія 1981 (з К.*Фукуі*).

М.М.Касцюковіч.

ХО́ФСТЭДТЭР, Хофштатэр (Hofstadter) Роберт (5.2.1915, Нью-Йорк — 17.11.1990), амерыканскі фізік. Чл. Нац. АН ЗША (1958). Скончыў Прынстанскі ун-т (1938). З 1946 у Прынстанскім, у 1950—85 у Станфардскім ун-тах (з 1971

Р.Хофман.

Р.Хофстэдтэр.

праф.). Навук. працы па даследаванні інфрачырв. выпрамянення, фотаправаднасці крышталёў, рассеяння электронаў высокіх энергій на атамных ядрах. Стварыў сцынтыляцыйны дэтэктар іанізавальных выпрамяненняў і часціц (1948). Адкрыў унутр. структуру нуклонаў і паказаў, што пратоны і нейтроны маюць цэнтр. дадатна зараджаны асяродак, акружаны падвойным воблакам π-мезонаў (1956—57). Нобелеўская прэмія 1961 (з Р.Л.*Мёсбаўэрам*). Нац. навук. медаль ЗША (1986).

Тв.: Electron scattering and nuclear and nucleon structure: A collection of reprints with an introduction. New York, 1963.

М.М.Касцюковіч.

ХОФТ (Hooft) Герардус (н. 5.7.1946, Дэн-Хелдэр, Нідэрланды), нідэрландскі фізік. Чл. Каралеўскай нідэрл. АН (1982), замежны чл. Нац. АН ЗША (1984). Скончыў Утрэхцкі ун-т (1972), дзе і працуе (з 1977 праф.). У 1972—74 у Еўрап. цэнтры ядз. даследаванняў (г. Жэнева, Швейцарыя). Навук. працы па каліброўчных тэорыях элементарных часціц, квантавай тэорыі гравітацыі і квантавай хромадынаміцы. Прапанаваў спец. каліброўкі вектарных палёў, прадказаў некат. эфекты электраслабых узаемадзеянняў, атрымаў ацэнкі мас вектарных базонаў. Нобелеўская прэмія 1999 (з М.*Вельтманам*; гл. Дадатак). Яго імем наз. малая планета.

Тв.: Рус. пер. — Калибровочные теории сил между элементарными частицами // Успехи физ. наук. 1981. Т. 135, № 3; Противостояние с бесконечностью // Там жа. 2000. Т. 170, № 11.

М.М.Касцюковіч.

ХОХ, Хоах (Hooch, Hoogh) Пітэр дэ (хрышчаны 20.12.1629, г. Ротэрдам, Нідэрланды — каля 1685), галандскі жывапісец. Вучыўся ў К.Берхема ў Харлеме (каля 1646—49). Працаваў у Дэлфце і Амстэрдаме. Зазнаў уплыў харлемскіх жанрыстаў Ф.*Халса*, Я.*Вермера* і К.Фабрыцыуса. Пісаў паэтычна адухоўленыя быт. сцэны, якія вылучаюцца залаціс тым каларытам, унутр. засяроджанасцю: «Раніца маладога чалавека», «Дворык», «Гульцы ў карты» (абедзве 1658), «Дама з двума кавалерамі», «Гаспадыня і служанка ў дворыку», «Маці ля калыскі» (усе каля 1660).

Літ.: Цырлин И. Питер де Хоох. М., 1955.

ХО́ЦЕМЛЯ, возера ў Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл., у бас. р. Дняпро, каля в. Чорнае, за 10 км на Пн ад г. Рэчыца. Пл. 0,4 км^2, даўж. 4,55 км, найб. шыр. 120 м, даўж. берагавой лініі 9,3 км. Катлавіна тыпу старыцы, вузкая, стужкападобнай формы, выцягнутая з Пд на ПнЗ. Схілы катлавіны выш. да 17 м (усходнія да 2 м), пад хмызняком. Берагі на У нізкія, на З зліваюцца са схіламі.

«ХО́ЦЕМЛЯ—АРГУНЫ́» («Chozemlja—Arguny»), кодавая назва карнай аперацыі ням.-фаш. захопнікаў супраць партыз. атрадаў 6-га «Марак» і 8-га імя М.Н.Селіваненкі партыз. брыгады «Аляксея», спец. групы БШПР пад камандаваннем В.Дз.Сазонава і мясц. насельніцтва ў Суражскім і Віцебскім р-нах 3.10.1942. Назва ад вёсак Хоцемля і Аргуны ў Лёзненскім р-не. Праводзілася падраздзяленнямі 237-га ахоўнага батальёна, 13-га паліцэйскага палка СС з прыдадзенымі ім процітанк. і мінамётнымі батарэямі на чале з камендантам Смаленска. Паводле плана штаба тылу групы армій «Цэнтр» аперацыя «Х.—А.» разам з карнай аперацыяй «*Маланка*» павінна была адчысціць ад партызан перадполле чыг. Полацк—Смаленск. Раптоўнай атакай з Пн і Пд карнікі хацелі ўварвацца ў партыз. лагер. Сілы праціўніка ў 4 разы перавышалі

П. дэ Хох. Гаспадыня і служанка ў дворыку. Каля 1660.

сілы партызан. Пасля 6-гадзіннага бою партызаны з баямі адышлі на ПнЗ. Не дасягнуўшы поспеху, карнікі падпалілі в. Хоцемля, расстралялі 97 яе жыхароў і каля 60 жанчын і дзяцей спалілі ў хатах; у в. Кавалёва Суражскага р-на спалілі больш за 50 двароў і расстралялі 40 жыхароў.

В.С.Лазебнікаў, У.С.Пасэ.

ХО́ЦІМКА, комплекс археал. помнікаў (гарадзішча, 4 селішчы і курганны могільнік) каля в. Хоцімка Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл. Вядомы таксама пад назвай Стары Шклоў. Гарадзішча абследавалі М.Балінскі і Т.Ліпінскі (1850), вывучалі В.Р.Тарасенка (1948), Г.В.Штыхаў (1964), В.М.Ляўко (1979). Пляцоўка памерам 70 × 60 м, з трох бакоў абмываецца р. Серабранка, з Пн і ПнУ прасочваюцца рэшткі вала выш. 1,8 м. Знойдзены ганчарная кераміка, шкляныя бранзалеты, жал. вырабы эпохі Кіеўскай Русі і ВКЛ. Селішчы 12—16 ст. даследавала Ляўко (1978—79). Знойдзены кераміка стараж.-рус. часоў і 14—16 ст., фрагменты гаршковай кафлі, каменнае ядро, жал. нажы, бронзавыя арнаментаваная накладка і фрагмент нацельнага крыжа, шкляныя бранзалеты, манеты 16—17 ст. і інш. У курганным могільніку 3 насыпы выш. 1,5 м. Ва ўрочышчы Зязюлін Роў знойдзены каменны ідал 10 ст. (гл. *Шклоўскі ідал*). Мяркуюць, што тут знаходзілася язычніцкае капішча. На думку Ляўко, у эпоху Кіеўскай Русі цэнтрам усіх навакольных паселішчаў з'яўлялася гарадзішча, якое было ці феад. сядзібай, ці пунктам збору даніны на дняпроўскім шляху.

ХО́ЦІМСК, гарадскі пасёлак, цэнтр Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл., на р. Беседзь пры ўпадзенні ў яе рэк Альшоўка і Жадунь. За 207 км ад Магілёва, 37 км ад чыг. ст. Камунары на лініі Крычаў—Унеча. Аўтадарогамі злучаны з Касцюковічамі і Суражам (Расія). 8 тыс. ж. (2001). Прадпрыемствы харч. прам-сці, пачатковай апрацоўкі лёну, буд. матэрыялаў. Сельгасхімія, камбінат быт. абслугоўвання; 2 сярэднія, муз., спарт. школы, школа-інтэрнат, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца, аддз. сувязі, *Хоцімскі гісторыка-краязнаўчы музей*. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан, магіла ахвяр фашызму. Помнікі архітэктуры: Свята-Троіцкая царква (сярэдзіна 19 ст.), царква на могілках (19 ст.), 2 жылыя дамы (пач. 20 ст.).

Засн. паміж 1695 і 1700 як слабада. У дакументах згадваецца з 1709. У 1714 у Х. 66 дымоў, млын, карчма, царква. Паводле універсала канцлера К.С.Радзівіла ад 19.10.1714 на левым беразе р. Беседзь насупраць вёскі Х. закладзена мяст. Радзівілаў; у 1727 у ім 148 дымоў, 3 вуліцы; у 1747 — 8 вуліц, 116 дымоў, царква Раства Багародзіцы са званіцай, сінагога, карчма, турма. З сярэдзіны 18 ст. Радзівілаў — цэнтр Бярозаўскай (Хоцімскай) вол. Крычаўскага староства, у крыніцах згадваецца як мяст. Х. Пасля 1772 Радзівілаў перайменаваны ў Х., на-

лежаў Р.А.Пацёмкіну. Спачатку быў у Крычаўскім графстве, потым у Клімавіцкім пав. Магілёўскай губ. У 1779 — 568 ж., 105 двароў. У 19 ст. мяст. Х. належала Галынскім, Кучэўскай, кн. Абаленскаму. У 1844 — 1828 ж., 139 двароў, 2 царквы, касцёл, у 1860—70-я г. — 5 пенькатрапальных прадпрыемстваў, маслабойня, крупадзёрка, вінакурны і піварны з-ды.

У 1880 — 1849 ж., 274 дамы, валасная ўправа, нар. вучылішча, 2 царквы, 2 малітоўныя дамы, у 1897 — 3030 ж., 416 двароў. З крас. 1919 у Гомельскай губ. РСФСР, з сак. 1924 у складзе БССР. З 17.7.1924 да 8.7.1931 і з 12.5.1935 цэнтр *Хоцімскага раёна* Калінінскай, з чэрв. 1927 — Магілёўскай акруг. У 1926 — 2,9 тыс. ж. У 1931—35 у складзе Касцюковіцкага р-на, са студз. 1938 у Магілёўскай вобл. З 27.9.1938 гар. пасёлак. 15.8.1941 акупіраваны ням. фашыстамі, якія загубілі тут 700 жыхароў. 23.10.1941 партызаны дыверсійна-разведвальнага атрада НКДБ СССР і 2-га Хоцімскага атрада ўчынілі ў Х. напад на ням. гарнізон. Вызвалены 26.9.1943 у ліку першых райцэнтраў Беларусі войскамі 50-й арміі Бранскага фронту ў ходзе *Бранскай аперацыі 1943*. З 17.4.1962 да 30.7.1966 у складзе Касцюковіцкага р-на.

А.А.Мяцельскі.

ХО́ЦІМСКАЯ ПЕНЬКАТРАПА́ЛЬНАЯ ФА́БРЫКА. Дзейнічала ў 1866—1914 у мяст. *Хоцімск* Клімавіцкага пав. (цяпер гар. пасёлак, цэнтр Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл.). Мела паравы рухавік. У 1881 працавала 10 чал., апрацавана 1050 пудоў пянькі. У 1910 працавала 50 чал.

ХО́ЦІМСКІ Міхаіл Васілевіч (27.2.1903, г.п. Шарашова Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. — 25.11.1986), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў Аб'яднаную ваен. школу імя ВЦВК (1925), бранятанк. курсы ўдасканалення камсаставу (1932), Ваен. акадэмію механізацыі і матарызацыі РСЧА (1937). У Чырв. Арміі з 1921. Удзельнік грамадз. вайны 1918—20. У Вял. Айч. вайну з 1941 на фронце. Удзельнік баёў пад Масквой, Варонежам, Сталінградам, вызвалення Украіны, Беларусі, Польшчы. Механіз. брыгада на чале з палк. Х. у час Віслa-Одэрскай аперацыі 1945 з баямі прайшла ад р. Вісла да р. Одэр, вызваліла больш за 300 нас. пунктаў, нанесла праціўніку значны ўрон у баявой тэхніцы і жывой сіле. Да 1952 у Сав. Арміі. Ганаровы грамадзянін г. Пружаны Брэсцкай вобл.

ХО́ЦІМСКІ ГІСТО́РЫКА-КРАЯЗНА́ЎЧЫ МУЗЕ́Й. Засн. ў 1996, адкрыты ў 1998 у г.п. Хоцімск Магілёўскай вобл. Пл. экспазіцыі 216 м^2, 300 экспанатаў асн. фонду (2003). Аддзелы: старажытнасць, этнаграфія, прырода, гісторыя краю; выставачная зала. Сярод экспанатаў каменныя прылады працы, фрагменты керамічнага посуду, калекцыі манет з курганных могільнікаў Хоцімск і Трасціно, калекцыі нар. адзення краснапольскага строю, вырабы майстроў ткацтва, саломапляцення, разьбы па дрэве канца 19 — пач. 20 ст., матэрыялы пра падзеі грамадз. вайны 1918—20, дзейнасць падполля і партыз. злучэнняў у Вял. Айч. вайну на тэр. раёна, землякоў Герояў Сав. Саюза М.К.*Піліпенку* і Я.Я.*Сускo*, выдатных людзей Хоцімшчыны. У экспазіцыі чучалы прадстаўнікоў дзікай жывёлы і птушак рэгіёна.

І.І.Казлоў.

М.В.Хоцімскі.

ХО́ЦІМСКІ РАЁН. Размешчаны на У Магілёўскай вобл. Утвораны 17.7.1924 (8.7.1931 быў скасаваны, 12.5.1935 адноўлены, 17.4.1962 зноў скасаваны, 30.7.1966 адноўлены). Пл. 0,9 тыс. км^2. Нас. 15,4 тыс. чал. (2003), гарадскога 46,8%. Сярэдняя шчыльн. 17 чал. на 1 км^2. Цэнтр — г.п. *Хоцімск*. Раён уключае 82 сельскія нас. пункты, 9 сельсаветаў: Батаеўскі, Баханскі, Бярозкаўскі, Бяседавіцкі, Велікаліпаўскі, Забялышынскі, Трасцінскі, Чарняўскі, Янаўскі.

Тэр. раёна ў межах *Аршанска-Магілёўскай раўніны* і *Чачорскай раўніны*. Паверхня раўнінная, у паўн.-зах. ч. з покрывам з лёсападобных суглінкаў і супескаў, дзе вылучаюцца ўзгорыста-западзінныя формы рэльефу; 95% яе на выш. 160—180 м. Найвыш. пункт 195 м (на Пн раёна, за 2 км на З ад в. Буда). Агульны нахіл паверхні з Пн на Пд. Карысныя выкапні: торф, сапрапель, трэпел, буд. пяскі, цагельныя суглінкі і гліны; праяўленні дала-

міту, мелу, фасфарытаў, шкловых пяскоў і інш. Сярэдняя т-ра студз. -8 °С, ліп. 18,5 °С. Ападкаў 593 мм за год. Вегетац. перыяд 185 сут. Найб. р. Беседзь з прытокамі Еленка, Альшоўка, Жадунь. Воз. Святое. Глебы с.-г. угоддзяў: дзярнова-падзолістыя (54,2%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (24,2%) і інш. Пад лесам 31% плошчы.

Найб. лясныя масівы на ПдУ. Пераважаюць хваёвыя, бярозавыя, яловыя, асінавыя, дубовыя, чорнаальховыя, трапляюцца ясянёвыя, кляновыя лясы. Штучныя насаджэнні (каля 27%) пераважна хваёвыя. Пад балотамі 4,6% тэр. У раёне заказнікі мясц. значэння: біялагічныя — урочышча Ерашоўшчына ў Забялышынскім лясніцтве, урочышча Барок у Хоцімскім лясніцтве, флоры і фауны ў Батаеўскім лясніцтве; гідралагічны — Лобня; воднарэжымны — Расчыстка (ахова тарфяніку). Помнікі прыроды мясц. значэння: батанічныя — бярозавы гай «Іваноўка» каля в. Іваноўка, бярэзнік каля в. Баханы, хвойнік і дуб чарэшчаты ў Хоцімскім лясніцтве, парк «Янаполле», дубы чарэшчатыя ва ўрочышчы Казлоўшчына каля в. Дубраўка, дуб чарэшчаты і лістоўніца каля в. Альшоў 1-ы; гідралагічныя — воз. Святое ў Хоцімскім лясніцтве, «Святая крыніца» ў Батаеўскім лясніцтве; біялагічны — урочышча Зайцавы Вугал (месца знаходжання сям'і мядзведзяў).

Агульная плошча с.-г. угоддзяў 49,3 тыс. га, з іх асушаных 11,5 тыс. га. На 10.6.2003 у раёне 2 унітарныя калектыўныя с.-г. прадпрыемствы, 10 с.-г. вытв. кааператываў, 2 фермерскія гаспадаркі. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, вырошчваюць збожжавыя і кармавыя культуры, бульбу, лён. Прадпрыемствы прам-сці: буд. матэрыялаў, харч. (малочныя вырабы, віно), кааператыўнай (хлеба-булачныя вырабы, безалкагольныя напіткі, каўбасы і інш.), першаснай апрацоўкі лёну (ільновалакно); камбінат быт. абслугоўвання (швейныя вырабы). Па тэр. раёна праходзяць аўтадарогі Чэрыкаў—Краснаполле—Хоцімск, Родня—Хоцімск. У раёне 10 сярэдніх, у т.л. 2 школы-сады, 6 пачатковых школ, школа-інтэрнат для дзяцей-сірот (базавая), 14 дашкольных устаноў, у т.л. 2 комплексы школа-сад, 15 дамоў культуры, 11 клубаў, 23 б-кі, аўтаклуб, 2 бальніцы, 1 паліклініка, 2 амбулаторыі, 16 фельч.-ак. пунктаў. *Хоцімскі гісторыка-краязнаўчы музей*. Выдаецца газ. «Шлях Кастрычніка».

Літ.: Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Магілёўская вобл. Мн., 1986.

К.І.Барадзенка, Р.Р.Паўлавец.

ХО́ЦІНСКАЕ ВО́ЗЕРА. У Бешанковіцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Ула, каля в. Хоціна, за 24 км на ПнЗ ад г.п. Бешанковічы. Пл. 0,22 км^2, даўж. 960 м, найб. шыр. 410 м, найб. глыб. 4,2 м, даўж. берагавой лініі 2,4 км. Пл. вадазбору 0,7 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу, выцягнутая з З на У. Схілы катлавіны выш. 5—8 м, разараныя, месцамі пад хмызняком. Берагі нізкія, пясчаныя, на З сплавінныя, на Пн зліваюцца са схіламі. На Пд і У забалочаная і парослая хмызняком пойма шыр. да 350 м. Дно дно глыб. 3 м пясчанае, ніжэй сапрапелістае. Зарастае да глыб. 2 м. Упадаюць 2 канавы.

ХО́ЦЬКАЎСКАЕ ВО́ЗЕРА. У Бешанковіцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Свінка (цячэ праз возера), каля в. Доўгае, за 12 км на ПдЗ ад г.п. Бешанковічы. Пл. 0,22 км^2, даўж. 1,13 км, найб. шыр. 270 м, найб. глыб. 4,3 м, даўж. берагавой лініі 2,4 км. Пл. вадазбору 28,3 км^2. Катлавіна лагчыннага тыпу, выцягнута з Пн на Пд. Схілы катлавіны выш. 7—10 м (на Пн 4—5 м), пераважна разараныя або пад пашай, на ПдУ параслі лесам. Берагі на З высокія, на У нізкія, месцамі абразійныя, на Пн і Пд сплавінныя (шыр. сплавіны да 50 м). На Пн і Пд пойма шыр. да 100 м. Дно выслана гліністым ілам. Зарастае.

ХО́ЦЬКАЎСКАЯ РАЗНА́Я КОСЦЬ, рускі маст. промысел. Існуе з 1947 у г. Хоцькава Маскоўскай вобл., калі была арганізавана арцель «Народнае мастацтва», з 1960 ф-ка «Народнае мастацтва», з 1970 ф-ка разных маст. вырабаў, з 1993 т-ва «Народнае мастацтва». Засн. на традыцыях апрацоўкі косці (халмагорскай разьбы) і цвёрдых парод дрэва. У 1950—60-я г. майстры стваралі анімалістычную скульптуру і куфэркі з мамантавай косці, самшыту, рогу, перламутру. З канца 1960-х г. асн. матэрыял — косць буйн. раг. жывёлы, з якой рабілі куфэркі, пудраніцы, пярсцёнкі, брошкі, завушніцы, упрыгожаныя расл. арнаментам. У 1990-я г. адрадзілася і разьба па мамантавай косці. *Я.М.Сахута.*

ХО ШЫ МІН [Hồ Chí Minh (сапр. імя Нгуен Тат Тхань) 19.5.1890, в. Кімліен, правінцыя Нгеан, В'етнам — 3.9.1969], дзяржаўны і паліт. дзеяч В'етнама. Скончыў Нац. каледж у г. Хюэ. Выкладаў у навуч. установах г. Сайгон. У 1916—23 жыў у Вялікабрытаніі, ЗША і Францыі. З 1917 чл. Франц. сац. партыі, з 1920 чл. Франц. камуніст. партыі. У 1923—24 у СССР, працаваў у Камуністычным інтэрнацыянале. У 1924 накіраваны Камінтэрнам у Кітай (у 1925 стварыў у г. Гуанчжоў Таварыства рэв. моладзі В'етнама). Пасля разрыву Камуніст. партыі Кітая з *Гаміньданам* (1927) вярнуўся ў СССР. У 1928—30 прадстаўнік Камінтэрна ў Сіяме (Тайланд). У 1930 арганізаваў у Сянгане (Ганконгу) устаноўчы з'езд Камуніст. партыі Індакітая (КПІК). За рэв. дзейнасць прыгавораны завочна франц. судом да смяротнага пакарання. У 1934—38 вучыўся ў Камуніст. ун-це працоўных Усходу ў Маскве. З 1938 у Яньані — сталіцы камуніст. раёнаў Кітая. У 1941 вярнуўся ў В'етнам і ўзначаліў патрыят. арг-цыю *В'етмінь*. У 1942—43 зняволены ў гаміньданаўскай турме. Пасля абвяшчэння 2.9.1945 Дэмакр. Рэспублікі В'етнам (ДРВ) старшыня яе Часовага ўрада. З сак. 1946 прэзідэнт ДРВ, адначасова ў 1946—55 прэм'ер-міністр. У 1946—51 ген. сакратар ЦК КПІК. У 1951—60 ген. сакратар ЦК Партыі працоўных В'етнама, створанай на базе КПІК, у 1951—69 таксама старшыня ЦК ППВ. У 1950—54 узначальваў узбр. барацьбу супраць франц. каланізатараў, у 1960-я г. — барацьбу за аб'яднанне краіны. Пахаваны ў маўзалеі.

Тв.: Рус. пер. — Избранное. М., 1979.

Літ.: Афонин С.Н., Кобелев Е.В. Товарищ Хо Ши Мин. М., 1980; Кобелев Е.В. Хо Ши Мин. 2 изд. М., 1983; Хонг Ха. Хо Ши Мин в Стране Советов: Пер. с вьет. М., 1986; Избранное: Воспоминания о Хо Ши Мине. М., 1990. *В.У.Адзярыха.*

Хо Шы Мін.

ХРАМ, культавае збудаванне, прызначанае для богаслужэння і рэліг. абрадаў. Часам Х. мелі мемар. характар, адыгрывалі ролю абарончых збудаванняў (гл. *Храм-крэпасць*). Сваімі памерамі, манум. формамі і дэкар. убраннем Х. вылучаюцца сярод гар. ці вясковай забудовы, найчасцей размяшчаюцца на вузлавых участках населеных пунктаў, маюць вял. горадабуд. значэнне. Архітэктура розных тыпаў Х. фарміравалася пад уплывам культавых патрабаванняў, удасканальвання арх.-буд. прыёмаў, развіцця дойлідства ў розных краінах, набывала выразную нац. своеасаблівасць. Кожны элемент Х. і яго маст. аздабленне мае сімвалічны сэнс і адлюстроўвае светапогляд пэўных гіст. эпох.

Паводле рэліг. дагматыкі Х. лічыцца домам Бога (багоў) і мае *алтар*. Вядомы Х. ў язычніцкіх рэлігіях, у будызме, Іерусалімскі Х. у стараж. іудаізме. На Беларусі пашыраны хрысц. Х. (*цэрквы, саборы, касцёлы*); культавыя будынкі ў пратэстантызме (*зборы*, малельныя дамы), а таксама *сінагогі* і *мячэці* не маюць алтара і лічацца не Х., а месцам малітвы.

С.А.Сергачоў.

ХРАМА.., ХРОМА.., ...ХРОМ (ад грэч. chrōma колер, фарба), часткі складаных слоў, якія паказваюць на адносіны да колеру, афарбоўкі (напр., *храмафоры, хромалітаграфія*; *цытахромы*), а таксама да хрому і яго злучэнняў, што ўваходзяць у састаў фарбавальных прэпаратаў (напр., хромамагнезіт).

ХРАМАГЕ́НЫ [ад *храма...* + *ген*(ы)], рэчывы расл., жывёльнага і штучнага паходжання, якія змяшчаюць *храмафоры* і афарбоўваюцца пры акісленні; адноўленая форма дыхальных пігментаў. Аснова Х. — ядро (кальцавая структура), да якога далучаны храмафорныя групы (напр., CH-CH- этыленавая). Да Х. адносяцца β-карацін (фарбавальнік морквы), ўрахром (пігмент мачы), *меланін*, дыхальныя Х. (напр., *гемаглабін*) і інш. Адыгрываюць важную ролю ў фотасінт., акісляльна-аднаўляльных, ахоўных працэсах і інш.

І.М.Семяненя, А.Р.Давыдоўскі.

ХРАМАМЕ́РЫ (ад *храма...* + грэч. meros частка), патоўшчаныя, шчыльна спіралізаваныя ўчасткі дэзоксірыбануклеапратэідных нітак *храмасомы*, што ўтвараюцца ў выніку мясц. скручвання. Афарбоўваюцца ядзернымі фарбавальнікамі. Выяўляюцца пад мікраскопам у *прафазе меёзу*, маюць выгляд цёмнаафарбаваных гранул, размешчаных як пацеркі па даўж. храмасомы. У Х. сканцэнтравана да 95% усёй ДНК храмасомы. Форма, памеры, колькасць Х. пастаянныя; яны ўтвараюць храмамерны малюнак, які мае відавую, тканкавую, узроставую спецыфічнасць і выкарыстоўваецца для ідэнтыфікацыі храмасом пры цытагенет. даследаваннях. Генетыч. значэнне Х. і міжхрамамерных участкаў застаецца не вызначаным. *Р.Г.Заяц.*

ХРАМАПЛА́СТЫ (ад *храма...* + грэч. plastos вылеплены, афармлены), арганоіды (*пластыды*) расл. клеткі. Бываюць жоўтага, аранжавага і чырв. колеру, што абумоўлена наяўнасцю пігментаў — *каратыноідаў*. Знаходзяцца ў клетках пладоў, пялёсткаў, у асеннім лісці, радзей у каранях (морква). Ад *цытаплазмы* адасоблены падвоенай мембранай, унутр. мембранная сістэма пераважна адсутнічае. На канчатковым этапе развіцця пластыд *хларапласты* і *лейкапласты* ператвараюцца ў Х.

ХРАМАСКО́П (ад *храма...* + *...скоп*), прылада для атрымання каляровага відарыса аптычным сумяшчэннем 2 ці 3 колерападзеленых (гл. *Колерадзяленне*) чорна-белых фатагр. відарысаў, асветленых праз адпаведныя святлафільтры. Распрацаваны франц. вучоным Л.Дзюко дзю Аронам (1862). Выкарыстоўваецца ў спектразанальнай фатаграфіі на чорна-белых фотаплёнках.

ХРАМАСО́МНАЯ ТЭО́РЫЯ СПА́ДЧЫННАСЦІ, тэорыя аб лакалізацыі фактараў *спадчыннасці* ў *храмасомах* клетак. Распрацавана Т.*Боверы* (1902—07) і амер. вучоным У.Сетанам (1902—03). Х.т.с. ўсталёўвае, што пераемнасць адзнак арганізмаў у шэрагу пакаленняў вызначаецца пераемнасцю іх храмасом. *Гены*, лакалізаваныя ў храмасоме, складаюць групу счаплення і перадаюцца сумесна; колькасць груп счаплення роўная гаплоіднай колькасці храмасом і пастаянная для кожнага віду арганізмаў; адзнакі, што залежаць ад счаплення генаў, таксама наследуюцца сумесна. Счэпленае наследаванне адзнак парушаецца ў выніку перакрыжавання храмасом, якое прыводзіць да пераразмеркавання генет. матэрыялу паміж гомалагічнымі храмасомамі ў працэсе меёзу (гл. *Рэкамбінацыя*). Х.т.с. дазволіла сфармуляваць адзін з найважн. прынцыпаў генетыкі аб адзінстве дыскрэтнасці і бесперапыннасці генет. матэрыялу.

Літ.: Морган Т.Г. Структурные основы наследственности: Пер. с англ. М., 1924; Глушакова Т.И. Развитие представлений об индивидуальности хромосом. М., 1983. *Р.Г.Заяц.*

ХРАМАСО́МНЫ БАЛА́НС, устойлівы стан спадчыннай структуры арганізма, абумоўлены нармальнай колькасцю *храмасом*. Збалансаваным лічыцца храмасомны набор, у якім колькасць храмасом кратная гаплоіднаму (адзінарнаму) набору. Прамежкавы стан (*анеуплаідыя*) звычайна вядзе да нежыццяздольнасці або нестабільнасці *генатыпа*.

ХРАМАСО́МНЫ НАБО́Р у генетыцы, тое, што *карыятып*.

ХРАМАСО́МНЫЯ МУТА́ЦЫІ, гл. ў арт. *Храмасомныя перабудовы*.

ХРАМАСО́МНЫЯ ПЕРАБУДО́ВЫ, храмасомныя аберацыі, тып *мутацый*, што мяняюць структуру *храмасом*. Узнікаюць спантанна, але часцей пад уздзеяннем *мутагенаў*. Адрозніваюць перабудовы ўнутрыхрамасомныя (*інверсіі, дуплікацыі, дэлецыі*) і міжхрамасомныя (*транслакацыі*). Існуюць таксама асобыя тыпы Х.п. — робертсанаўскія транслакацыі, утварэнне кальцавых храмасом з нармальных «палачкападобных», папярочны, а не падоўжны, разрыў храмасом і інш. Х.п. выклікаюць змены марфал. адзнак, паніжэнне жыццяздольнасці, часам гібель арганізма (гомазіготы па Х.п. звычайна нежыццяздольныя). Адыгрываюць пэўную ролю ў эвалюц. працэсе (асабліва інверсіі, дуплікацыі і транслакацыі). Выкарыстоўваюцца ў генет. аналізе (напр., дэлецыі — для карціравання мутагенных *алеляў* нармальных *генаў*). Аналіз частаты Х.п. ў культуры клетак пад уздзеяннем пэўнага фактара дазваляе хутка ацаніць яго мутагеннасць. Выяўляецца Х.п. цытагенет. метадамі. *Р.Г.Заяц.*

ХРАМАСО́МНЫЯ ХВАРО́БЫ, група захворванняў, звязаных з анамаліямі *храмасом* у палавых клетках бацькоў або аплодненай яйцаклетцы. Бываюць поўныя (усе клеткі арганізма маюць храмасомную анамалію) і мазаічныя (анамалію мае ч. клетак). Храмасомныя анамаліі пры Х.х. — змена колькасці храмасомных набораў (тры- і тэтраплоідны), асобных храмасом — трысамія і монасамія; змена структуры храмасом (недахоп асобнага ўчастка, яго падваенне і інш.). Частата Х.х. ў нованароджаных дзяцей каля 1%. Змены храмасом бываюць прычынай спантанных абортаў і мёртванараджэння. Асн. прыкметы: заганы твару, чэрапа, нерв., сардэчна-сасудзістай, мочапалавой сістэм і інш.; затрымка псіхічнага і фіз. развіцця; абменныя парушэнні. Пры некат. Х.х. налічваецца да 20 анамалій. Дыягностыка засн. на клінічна-анат. і генет. (храмасомных) метадах. Лячэнне кансерватыўнае, хірургічнае. Гл. таксама *Спадчынныя хваробы*. *І.М.Семяненя.*

ХРАМАСО́МЫ (ад *храма...* + *сома*), арганоіды клетачнага ядра, якія з'яўляюцца носьбітамі *генаў* і вызначаюць спадчынныя ўласцівасці клетак і арганізмаў. Здольныя да самаўзнаўлення, маюць структурную і функцыян. індывідуальнасць і захоўваюць яе ў шэрагу пакаленняў. Тэрмін «Х.» прапанаваў ням. вучоны В.Вальдэер (1888). У светлавым мікраскопе найб. ясна Х. выяўляюцца на стадыі *метафазы* дзялення клетак у выглядзе палачкападобных цел рознай канфігурацыі. Кожная «палачка» мае 2 *храматыды*, злучаныя *цэнтрамерай*. Аснова Х. — бесперапынная двухланцужковая малекула *дэзоксірыбануклеінавай кіслаты* (ДНК) (у Х. каля 99% ДНК клеткі), звязаная з бялкамі ў нуклеапратэід. Будова малекулы ДНК, яе генет. код забяспечвае запіс спадчыннай інфармацыі, а бялкі (у Х. вышэйшых раслін і жывёл іх змяшчаецца да 65%) удзельнічаюць у складанай упакоўцы ДНК у Х. і рэгуляцыі яе здольнасці да сінтэзу *рыбануклеінавых кіслот* (РНК) — *транскрыпцыі*.

У працэсе функцыянавання структурна-марфал. пераўтварэнні Х. адбываюцца шляхам спіралізацыі і дэспіралізацыі яе структурных субадзінак. У клетках цела (саматычных клетках) двухполых жывёл і раслін кожная Х. прадстаўлена



Храмасома ў метафазе мітозу (А) і прафазе меёзу (Б): 1 — храматыда; 2 — цэнтрамера; 3 — храмамеры; 4 — тэламеры.



Да арт. **Храмасомы**. Храмасомны набор мужчыны: А, В, С, Д, Е, F, G — групы пар аўтасом; XY — палавыя храмасомы.

двойчы: адна паходзіць ад матчынага, другая ад бацькоўскага арганізма. Такія храмасомы наз. гомалагічнымі, набор гомалагічных Х. — дыплоідным. Палавыя клеткі, што ўтварыліся ў выніку *мейёзу*, маюць у гаплоідным наборы па адной гомалагічнай храмасоме. Колькасць Х. у клетках арганізма вагаецца ад 2 да некалькіх соцень (у чалавека 46) і складае храмасомны набор (гл. *Карыятып*) розных відаў. Кожны від арганізмаў мае характэрны і пастаянны набор Х., замацаваны ў эвалюцыі дадзенага віду, а яго змены адбываюцца толькі ў выніку *мутацый*. Да генет. апарата бактэрый і вірусаў з адной лінейнай ці кальцавой Х., якая не мае надмалекулярнай укладкі і не адасоблена ад цытаплазмы ядзернай абалонкай, тэрмін Х. ўжываецца ўмоўна. Гл. таксама *Рэплікацыя*.

Літ.: Кикнадзе И.И. Функциональная организация хромосом. Л., 1972; Босток К., Самнер Э. Хромосома эукариотической клетки: Пер. с англ. М., 1981; Bradbury E., Maclean N., Matthews H. DNA, chromatin and chromosomes. Oxford, 1981. *Р.Г.Заяц.*

ХРАМАСФЕ́РА (ад *храма...* + *сфера*), слой *атмасферы зорак* паміж фотасферай і каронай. Таўшчыня Х. Сонца каля 10 тыс. км. Назіраецца простым вокам у час поўных сонечных *зацьменняў* у выглядзе яркага ружовага кольца вакол Сонца. Адрозніваецца неаднароднасцю т-ры (5—15 тыс. К), шчыльнасці і інш. фіз. параметраў. Характарызуецца лінейчастым эмісійным спектрам. Элементы структуры — храмасферная сетка і спікулы. Ячэйкі сеткі — дынамічныя ўтварэнні дыяметрам 20—50 тыс. км, у якіх плазма рухаецца ад цэнтра да перыферыі.

Літ.: Гурзадян Г.А. Звездные хромосферы... М., 1984.

ХРАМАТАГРА́ФІЯ (ад *храма...* + *...графія*), метад раздзялення, аналізу і фіз.-хім. даследавання рэчываў. Засн. на размеркаванні рэчываў паміж дзвюма фазамі — рухомай (паток газу ці вадкасці) і нерухомай (пераважна сарбент). Паток рухомай фазы фільтруецца праз слой сарбенту ці перамяшчаецца ўздоўж яго. Адкрыта рас. вучоным М.С.*Цветам* (1903) пры раздзяленні сумесі пігментаў зялёных раслін.

Паводле агрэгатнага стану рухомай фазы адрозніваюць Х. газавую, флюідную і вадкасную; паводле механізма раздзялення рэчываў — адсарбцыйную, размеркавальную, іонаабменную, эксклюзійную, афінную, лігандаабменную, асадкавую і інш. Адсарбцыйная Х. заснавана на рознай ступені *сорбцыі* рэчываў адсарбентам; размеркавальная — на рознай растваральнасці кампанентаў сумесі ў нерухомай і рухомай фазе; іонаабменная — на рознай хім. роднасці рэчываў да іонаабменніка; эксклюзійная — на рознай пранікальнасці малекул кампанентаў у нерухомую фазу (высакапорысты неіонагенны гель); афінная — на спецыфічным узаемадзеянні біямалекул з *лігандамі* сарбенту; лігандаабмен-

ная — на рознай здольнасці рэчываў да ўтварэння сувязей з катыёнамі металаў лігандаў сарбенту; асадкавая — на здольнасці кампанентаў сумесі ўтвараць нерастваральныя злучэнні пры кантакце з паверхняй нерухомай фазы. Нерухомая фаза (сарбцыйны слой) мае плоскую (у танкаслойнай і папяровай Х.) ці калоначную формы. Паводле спосабаў уводу пробы і перамяшчэння храматаграфічных зон па слоі сарбенту адрозніваюць элюэнтную Х. (сумесь, што аналізуецца, перыядычна імпульсна ўводзяць у паток рухомай фазы; сумесь падзяляецца на зоны асобных кампанентаў, паміж якімі знаходзяцца чыстыя зоны), франтальную (сумесь бесперапынна падаюць у калонку; толькі першы кампанент атрымліваюць у чыстым выглядзе, астатнія зоны змяшчаюць па 2 і больш кампанентаў) і выцясняльную (у калонку пасля сумесі падаюць выцяснялънік і атрымліваюць зоны чыстых рэчываў, паміж якімі — зоны іх сумесей) і інш.

Аналітычную Х. выкарыстоўваюць у навук. даследаваннях, медыцыне, ахове прыроды, хім., фармацэўтычнай, газавай і нафтаперапр. прам-сці; прэпаратыўную Х. — для атрымання чыстых рэчываў у неабходнай колькасці і інш.

Літ.: Хроматография: Пер. с англ. [Ч.] 1—2. М., 1986; Гольберт К.А., Вигдергауз М.С. Введение в газовую хроматографию. 3 изд. М., 1990; Количественный анализ хроматографическими методами: Пер. с англ. М., 1990; Аналитическая хроматография. М., 1993. *У.А.Вінарскі.*

ХРАМАТАФО́РЫ (ад *храма...* + грэч. phoros які нясе), 1) арганоіды водарасцей, якія маюць пігменты, што забяспечваюць *фотасінтэз*. Для кожнай групы водарасцей характэрны пэўны састаў пігментаў. 2) Мембранныя ўнутрыклетачныя структуры ў выглядзе везікул (пузыркоў), дзе размешчаны пігменты і адбываюцца пачатковыя стадыі фотасінтэзу ў некат. пурпурных бактэрый. Часам Х. наз. фотасінтэзавальны апарат пурпурных бактэрый незалежна ад яго формы. 3) У жывёл і чалавека Х. тое, што *пігментныя клеткі*.

ХРАМА́ТЫ, хромавакіслыя солі, солі *хромавых кіслот*. Найб. важныя Х. калію і натрыю. Пры падкісленні растворах Х. утвараюцца *дыхраматы*.

Моцныя акісляльнікі. Х. калію і натрыю растваральныя ў вадзе. Нерастваральныя Х. свінцу, волава, цынку — *кроны*. Х. калію (K_2CrO_4) і натрыю (Na_2CrO_4) — жоўтыя крышталі; у Х. калію $t_{пл}$ 968,3 °С, шчыльн. 2732 кг/м^3; у Х. натрыю $t_{пл}$ 790 °С, шчыльн. 2720 кг/м^3. Х. калію і натрыю выкарыстоўваюць як пратравы пры фарбаванні, як кансерванты драўніны і інш. Дыхраматы і Х. калію і натрыю таксічныя (іх аэразолі, напр., выклікаюць запаленне гартані і прыдаткаў насавой поласці). Некат. канцэрагенныя; ГДК (у пераліку на CrO_3) 0,01 мг/м^3. Х. прыродныя — клас мінералаў, солей хромавых к-т і некат. буйных катыёнаў (Pb^{2+}, K^+, радзей Ca^{2+}). Гал. мінерал — *кракаіт*. *А.П.Чарнякова.*

ХРАМАТЫ́ДА (ад *храма...* + грэч. eidos выгляд), структурны, фізіял. і мех. элемент *храмасомы*. Фарміруецца ў *інтэрфазе* ядра клеткі шляхам падваення храмасомы. Найб. распазнавальная ў *метафазе мітозу*, калі храмасомы маюць 2 Х.; пасля завяршэння стадыі Х. разыходзяцца ў даччыныя ядры і становяцца самаст. храмасомамі. У *меёзе* гомалагічныя храмасомы збліжаюцца парамі і ўтвараюць структуру з 4 Х. (*тэтрада*). *Р.Г.Заяц.*

ХРАМАТЫ́ЗМ (ад грэч. chrōmatismos афарбоўка) у музыцы, паўтонавае змяненне дыятанічнай ступені, у выніку якога ўзнікае храматычны паўтон. Абазначаецца знакам альтэрацыі (дыезам, бемолем або бекарам). Як гукавышынная з'ява абумоўлівае структурна-лагічную і інтанацыйна-выразную спецыфіку ці своеасаблівасць *храматыкі* — адной з асн. (побач з *дыятонікай*) ладавых сістэм у музыцы.

Літ.: Гл. да арт. *Храматыка*. *Т.С.Ляшчэня.*

ХРАМА́ТЫКА (ад грэч. chrōma колер, фарба) у музыцы, ладавая сістэма з паўтонавай каардынацыяй гукавышынных суадносін. У стараж. муз. тэорыі і практыцы «хрома» — адзін з 3 асн. «родаў» тэтрахорда (4-ступеннага гукарада ў дыяпазоне чыстай кварты) разам з «дыятонам» і «энармоніяй». У класічнай і сучаснай музыцы Х. — розныя паводле паходжання гукавыя рады, значным кампанентам якіх з'яўляецца храматычны (утвораны ад адной ступені) паўтон (до — до-дыез, рэ — рэ-бемоль).

Х. ўзнікае і існуе ў інтанацыйных спалучэннях з дыятанічнымі ступенямі як надбудова над апорнай дыятанічнай асновай, чым абумоўлены яе другасны, вытворны характар (гл. *Дыятоніка*). Сістэматызацыя храматычных гукарадоў ажыццяўляецца з улікам колькаснага (поўныя і няпоўныя, што сведчыць аб адсутнасці строгай рэгламентацыі іх гукавога напаўнення) і якаснага (унутрытанальная, або альтэрацыённая, мадуляцыйная і мікставая Х.; гл. *Альтэрацыя*, *Мадуляцыя*, *Танальнасць*) параметраў. У сучаснай музыцы выкарыстоўваецца аўтаномная, або натуральная Х., якая не мае дыятанічнай падасновы і складаецца з 12 самаст. паўтонаў-ступеней. У некат. сучасных тэхніках муз. кампазіцыі (*санорыка*, электронная музыка і інш.) ужываецца мікрахраматыка, дзе вышынная адлегласць сумежных гукаў меншая за паўтон. Гл. таксама *Храматызм*.

Літ.: Кац Ю. О принципах классификации диатоники и хроматики // Вопросы теории и эстетики музыки. Л., 1975. Вып. 14; Холопов Ю. Гармония: Теорет. курс. М., 1988. *Т.С.Ляшчэня.*

ХРАМАТЫ́ЧНАЯ АБЕРА́ЦЫЯ, адна з асн. *аберацый аптычных сістэм*, абумоўленая залежнасцю паказчыка пераламлення празрыстага асяроддзя ад даўжыні хвалі святла (гл. *Дысперсія хваль*). Выяўляецца ў аптычных сістэмах з пераламляльнымі элементамі, напр., лінзамі (люстэркам не ўласціва).

ХРАМАФІ́ННАЯ СІСТЭ́МА ў жывёл і чалавека, гл. ў арт. *Храмафінныя клеткі*.

ХРАМАФІ́ННЫЯ КЛЕ́ТКІ (ад *храма...* + лац. affinis роднасны), адрэналавыя клеткі, унутрысакраторныя клеткі ў арганізме пазваночных жывёл і чалавека, што выпрацоўваюць, назапашваюць і выдзяляюць пераважна *катэхаламіны*. У эмбрыягенезе развіваюцца з нейраэктадэрмы. Маюць поліганальную або няправільную форму, аплеценыя капілярамі і ўтвараюць *параганглії* ў розных участках цела (блізка да нерв. гангліяў і валокнаў, у вобласці шыйна-грудных сасудаў, парэнхіме органаў). Самая вял. колькасць Х.к. у мазгавым слоі надныračнікаў.

У цытаплазме клетак знаходзяцца сакраторныя гранулы, якія пасля фіксацыі солямі хрому набываюць цёмна-карычневую афарбоўку (адсюль назва). Гранулы маюць *адрэналін*, *норадрэналін*, а таксама АТФ, энкефаліны і хромагранін. Сакрэцыя катэхаламінаў з Х.к. адбываецца пры стымулюючым уздзеянні прэгангліянарных сімпатычных валокнаў. Сукупнасць Х.к. арганізма складае адрэналавую (храмафінную) сістэму, клеткі якой разам з сімпатычнай нерв. сістэмай удзельнічаюць у адаптыўных рэакцыях арганізма на ўздзеянне фактараў навакольнага асяроддзя. *А.С.Леанюк.*

ХРАМАФО́РЫ, групы атамаў (-CH=CH-, -CH=N-, -N=N-, =C=O і інш.), адказныя за афарбоўку арган. злучэнняў. Тэрмін увёў ням. вучоны О.Віт (1876) у прапанаванай ім храматафорнай тэорыі. Сучасныя ўяўленні аб сувязі афарбоўкі арган. рэчываў з іх будовай гл. ў арт. *Колернасці тэорыя*.

ХРАМАЦІ́Н [ад грэч. chrōma (chrōmatis) колер, фарба], рэчыва (*нуклеапратэід*) клетачнага ядра расл. і жывёльных клетак, якое складае аснову *храмасом*. Тэрмін увёў В.*Флемінг* (1880). У цыталогіі пад Х. разумеюць дысперсны стан храмасом у *інтэрфазе* клетачнага цыкла. Асн. структурныя кампаненты Х. — *дэзоксірыбануклеінавыя кіслоты* (30—45%), *гістоны* (30—50%) і негістонавыя бялкі (4—33%). На электронных мікрафотаздымках нагадвае пацеркі, «знізаныя» з нуклеасом — часцінак дыяметрам каля 10 нм. Адрозніваюць гетэрахрамацін (участкі Х., якія знаходзяцца ў кандэнсаваным стане на працягу ўсяго клетачнага цыкла) і эўхрамацін (больш актыўны і даступны для ферментаў, што забяспечваюць *транскрыпцыю*).

ХРАМАЦЭ́НТР (ад *храма...* + *цэнтр*), карыясома, гетэрахраматынавы ўчастак *храмасомы*, які захоўвае спіралізаваную структуру ў клетачным ядры, што знаходзіцца ў спакоі. Пад мікраскопам пасля афарбоўкі ядзернымі фарбавальнікамі мае выгляд глыбкі. Колькасць Х. мяняецца ў залежнасці ад колькасці храмасом у ядры і стадыі клетачнага цыкла. Набор Х. адлюстроўвае колькасць неактыўных у сінтэзе РНК участкаў храмасом і асаблівасці функцыянавання ядраў розных тыпаў клетак. Функцыі Х. застаюцца нявысветленымі. *Р.Г.Заяц.*

ХРАМЕ́ЛЬ [ад *хром* + *(нік)ель*], сплаў нікелю з хромам. Мае 10% хрому, каля 1% кобальту, дамешкі вугляроду і жалеза. Вызначаецца вял. і амаль лінейным змяненнем тэрмаэрс у шырокім інтэр-

вале т-р, высокай гарачаўстойлівасцю. Выкарыстоўваюць для вырабу *тэрмапар* (Х. — алюмель, Х. — капель).

ХРАМІРАВА́ННЕ, нанясенне *хрому* ці *хромавага сплаву* на паверхню метал. вырабаў для аховы ад карозіі, надання комплексу фізіка-хім. якасцей (зносаўстойлівасці, цвёрдасці і інш.) і з дэкар. мэтамі. Праводзяць пераважна электралітычным метадам (гл. *Гальванатэхніка*) ці дыфузнай *металізацыяй*. Выкарыстоўваюць пераважна для дэталей аўтамабіляў, веласіпедаў, рэзальных, вымяральных і мед. інструментаў.

ХРАМІ́ТЫ, назва мінералаў групы *шпінелей — хромшпінеліды*; гал. *хромавыя руды*.

ХРАМ-КРЭ́ПАСЦЬ, збудаванне, якое сумяшчае функцыі культавага і абарончага дойлідства. Як тып крапасных збудаванняў у краінах Зах. Еўропы вядомы з 12—13 ст., на Беларусі, а таксама ў Польшчы, Літве, на Украіне ў 15 — пач. 17 ст. Звычайна кампактная, прамавугольная ў плане пабудова з тоўстымі мураванымі сценамі, вежамі, амбразурамі, байніцамі, машыкулямі. У гатычных Х.-к. асн. аб'ём фланкіраваўся па вуглах 4 круглымі ці гранёнымі вежамі з байніцамі, меў высокі спічасты дах, па верху сцен пояс машыкуляў (*Сынковіцкая царква-крэпасць*, *Мураванкаўская царква-крэпасць*). Касцёлы і кальвінскія зборы таго часу звычайна мелі на гал. фасадзе магутную шматярусную вежу крапаснога тыпу (*Дзераўноўскі касцёл Благавешчання*, *Клецкі фарны Троіцкі касцёл*, *Койданаўскі кальвінскі збор*, *Навасвержанскі Петрапаўлаўскі касцёл*), па баках якой часам размяшчаліся 2 невял. баявыя вежы (*Гродзенскі фарны касцёл*, *Мірскі Мікалаеўскі касцёл*, *Смаргонскі кальвінскі збор*). У пач. 17 ст. з'явіліся Х.-к. з 2 вежамі па баках гал. фасада (*Камайскі касцёл*). У эпоху Адраджэння Х.-к. завяршаліся дэкар. абарончымі атыкамі. Абарончы характар мелі таксама некат. сінагогі (*Быхаўская сінагога*). *Т.В.Габрусь.*

ХРАМО́ВІЧ Георгій Антонавіч (22.11.1908, в. Ахоцічы Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл. — 5.3.1985), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыят. падполля і партыз. руху на Беларусі. Скончыў Выш. парт. школу пры ЦК КПСС (1956). З 1932 на парт. і гасп. рабоце, сакратар Чэрыкаўскага райкома КП(б)Б. У пач. Вял. Айч. вайны камандзір батальёна Чэрыкаўскага нар. апалчэння, потым сакратар Чэрыкаўскага падп. райкома КП(б)Б, камандзір і камісар партыз. атрадаў. У 1943—56 на парт. і сав. рабоце. Аўтар кніг «За́рава над Сожам» (1971), «Тры партызанскія гады» (2-е выд. 1981). Ганаровы грамадзянін г. Чэрыкаў.

ХРАМУ́ШЫН Генадзь Леанідавіч (12.12.1920, г. Кіраў, Расія — 2002), бел. скрыпач. Засл. арт. Беларусі (1968). Вучыўся ў Горкаўскім муз. вучылішчы, Маскоўскай кансерваторыі (1936—39). У 1935—41 працаваў у т-рах драмы, оперы і балета, філармоніі ў г. Горкі. У 1945—82 (з перапынкамі) працаваў у Дзярж. т-ры оперы і балета Беларусі.

ХРАНА.., ХРОНА... (ад грэч. chronos час), першая састаўная частка складаных слоў, якая паказвае на іх адносіны да часу (напр., *хранаскоп*, *храналогія*, *хронабіялогія*).

ХРАНАЛО́ГІЯ (ад *храна*,.. + *...логія*) гістарычная, спецыяльная гіст. навука, якая на падставе вывучэння і супастаўлення розных крыніц вызначае дакладныя даты гіст. падзей і дакументаў. Бярэ пачатак з практычнай (астр.) Х., якая распрацоўвала метады часалічэння, *календара*. Узнікла ў стараж. *Вавілоне* і Егіпце, развівалася ў Стараж. Грэцыі і *Рыме*.

У 45 да н.э. ў Рыме прыняты юліянскі каляндар (даўж. года 365,25 сутак у інтэрвале 4 гадоў), якім карысталіся ў краінах Еўропы да Новага часу. З прыняццем *хрысціянства* ў многіх краінах рабіліся спробы суаднесці біблейскую Х. з існуючымі каляндарнымі сістэмамі і вызначыць дакладную дату нараджэння Ісуса Хрыста. У 525 рым. манах Дыянісій Малы вызначыў, што Хрыстос нарадзіўся праз 753 гады пасля заснавання Рыма, або ў 284 эры Дыяклетыяна. З цягам часу гэта сістэма летазлічэння («наша эра») зацвердзілася ў краінах Зах. і Цэнтр. Еўропы. У *Візантыі* летазлічэнне вялося ад «стварэння свету» (пач. — 5508 да н.э.), год пачынаўся 1 вер. (т.зв. канстанцінопальская эра). Стараж. славяне карысталіся сонечным календаром: год падзяляўся на 12 месяцаў, пачынаўся 1 сакавіка. З *хрышчэннем Русі* (з 988) ва ўсх. славян распаўсюдзіўся візант. каляндар, аднак за пачатак года браўся дзень 1 сак., а не 1 вер. (як у Візантыі) або 1 студз. (як у Зах. Еўропе). Розніца ў паўгода паміж стараж.-рус. і візант. календаром выклікала існаванне на Русі 2 асн. сістэм летазлічэння: сакавіцкай (год адставаў ад візант. на паўгода) і ультрасакавіцкай (год абганяў візант. на паўгода). Зрэдку на Русі карысталіся вераснёўскай сістэмай (канстанцінопальскай эрай). Зберагліся сляды знаёмства ўсх. славян з інш. сістэмамі летазлічэння: антыяхійскай (пункт адліку — 1.9.5968 да н.э.), александрыйскай (25.3.5493), балгарскай (5504 да н.э.) эрамі і інш. Маскоўскі царк. сабор 1492 пастанавіў пачатак года лічыць 1 верасня. У 1700 у Расіі афіцыйна ўведзена летазлічэнне ад «нараджэння Хрыста» і пачаткам года загадана лічыць 1 студзеня па юліянскім календары.

Гэтая сістэма летазлічэння з 13 ст. выкарыстоўвалася на тэр. Полацкай, Смаленскай і Галіцка-Валынскай зямель. Пасля ўтварэння ВКЛ (сярэдзіна 13 ст.) і прыняцця хрысціянства ў Літве паводле каталіцкага абраду (1386) на беларускіх землях пашырэнне набыла і зах.-еўрап. сістэма летазлічэння; яна стала гал. у дзярж. канцылярыях ВКЛ. Летазлічэнне ад «стварэння свету» ўжывалася ў справаводстве правасл. царквы, у асн. традыц. жанрах бел. л-ры і пісьменнасці, у т.л. ў летапісанні, да пач. 16 ст. Бел. асветнік Ф.*Скарына* пашырыў летазлічэнне ад «нараджэння Хрыста» на пэўныя сферы ўсх.-слав. л-ры і пісьменнасці. Да 16 ст. ўжывалася датаванне дакументаў па гадах індыктаў — 15-гадовых цыклаў, што перыядычна паўтараліся. Шырокае распаўсюджанне ў ВКЛ атрымала практычная Х. з мэтай перакладу дат ад «стварэння свету» на даты ад «нараджэння Хрыста», для вызначэння дзён царк. свят, найперш Вялікадня. У 1582 ВКЛ разам з інш. еўрап. краінамі перайшло на больш дакладны грыгарыянскі каляндар (даўж. года ў сярэднім 365,2425 сутак), пры гэтым дні 1—14.10.1582 выкінуты з календара. Розніца паміж грыгарыянскім і юліянскім календарамі ў 16—17 ст. складала 10, у 18 ст. — 11, у 19 ст. — 12, у 20—21 ст. — 13 сутак. Правасл. царква ВКЛ працягвала адзначаць царк. святы паводле юліянскага календара. Пасля далучэння Беларусі да Рас. імперыі ў мясц. справаводства ўведзены (1800) юліянскі каляндар. Урад Сав. Расіі 1(14).2.1918 замяніў юліянскі каляндар на грыгарыянскі, пры гэтым дні 1—13.2.1918 былі выкінуты. Рус. правасл. царква, як і раней, працягвае карыстацца юліянскім календаром. Сістэматызацыю гіст. Х. ў 16 ст. ўвёў француз Ж.Скалігер, які распрацаваў дакладныя прыёмы пераводу розных летазлічэнняў на юліянскі стыль. Агульную тэорыю і гісторыю Х. даў у 19 ст. ням. вучоны Х.Ідэлер, у пач. 20 ст. іх развіў Ф.Гінцэль. Х. стараж.-рус. летапісання даследавалі гісторыкі В.М.*Тацішчаў*, М.М.*Карамзін*, М.П.*Пагодзін*, Дз.І.Празароўскі, А.А.*Шахматаў*, М.С.*Грушэўскі*, Н.В.Сцяпанаў, Б.А.*Рыбакоў*, А.Р.Кузьмін, М.Г.*Беражкоў* і інш.

Сістэмы летазлічэння, што выкарыстоўваліся на Беларусі, даследаваў М.І.*Гарбачэўскі*. Яго працы («Кароткія табліцы, неабходныя для гісторыі, храналогіі, наогул для ўсялякіх археалагічных даследаванняў і ў прыватнасці для разбору старажытных актаў і грамат заходняга краю Расіі і Царства Польскага», 1867, і інш.) заклалі падмурак бел. актавай Х. Гісторыю Х. і календара на Беларусі вывучалі Я.Ф.*Галавацкі*, М.Ф.Сумцоў, А.І.*Мілавідаў*, асобныя праблемы бел. Х. феад. перыяду — У.*Сямковіч*, А.*Гейштар*, Г.Я.*Галенчанка*, Г.Л.Харашкевіч і інш. Х. бел.-літ. летапісаў маладаследавана.

Літ.: Селешников С.И. История календаря и хронология. 3 изд. М., 1977; Хронологический справочник (XIX и XX вв.). Л., 1984; Климишин И.А. Календарь и хронология. 3 изд. М., 1990. *В.С.Пазднякоў.*

ХРАНАСКО́П (ад *храна*... + *...скоп*), прылада для параўнання паказанняў 2 гадзіннікаў і дакладнага вымярэння вельмі малых прамежкаў часу. Адлічвае інтэрвалы часу з дакладнасцю да 0,1 мс. З прыстасаваннем для фатаграфавання наз. фотахранометрам. Да сярэдзіны 20 ст. шырока выкарыстоўваўся ў астраноміі, фізіцы, эксперым. біялогіі і інш.; заменены больш дакладнай электроннай апаратурай.

ХРАНО́ГРАФ (ад *храна*... + *...граф*), зводны агляд усеагульнай гісторыі ў эпоху феадалізму. Прызначаўся для

пазнавальнага, павучальнага і займальнага чытання. Як жанр узнік у Візантыі. Візантыйскія Х. (Іаана Малалы, 6 ст., Георгія Амартала, 9 ст.) былі вядомы ў Кіеўскай Русі і паслужылі крыніцай рус. Х. (1-я рэдакцыя пач. 16 ст., «заходняруская» — сярэдзіны 16 ст.). На Беларусі ў 17—18 ст. была папулярная напісаная на старабел. мове буйная кампіляцыя «Вялікая хроніка», дзе ў белетрызаванай форме выкладзена сусв. гісторыя ад біблейскіх часоў да 17 ст., змешчаны розныя міфы, паданні, дакладныя гіст. звесткі і літ. творы. Жанравыя рысы Х. маюць таксама «Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі» М.Стрыйкоўскага, «Хроніка Еўрапейскай Сарматыі» А.Гваньіні і асабліва «Хроніка ўсяго свету» М.Бельскага, што бытавалі і ў бел. перакладах. Займальнае апісанне падзей, яркія характарыстыкі гіст. асоб, эмацыянальна-вобразны стыль выкладу, шырокае выкарыстанне ў Х. вымыслу прыцягвалі да гэтых твораў чытачоў і паўплывалі на развіццё гіст. прозы, на станаўленне маст. белетрыстыкі новага часу. *В.А.Чамярыцкі.*

ХРАНО́ГРАФ, прылада для вымярэння кароткіх інтэрвалаў часу і рэгістрацыі момантаў часу па дакладных гадзіннікаў (гл. *Квантавы гадзіннік*). Найб. пашыраны электрамагнітныя Х. — пішучыя, друкавальныя, фатаграфавальныя. Для вымярэння прамежкаў часу з вял. дакладнасцю выкарыстоўваюць электронныя і электронна-прамянёвыя Х. (хібнасць менш за 10^{-6} с). Х. выкарыстоўваюць у службе часу, навук. даследаваннях, тэхніцы.

ХРАНО́МЕТР (ад *храна...* + *...метр*), асабліва дакладны пераносны *гадзіннік*. Выкарыстоўваецца для захоўвання часу (напр., у навігацыі для захоўвання часу пачатковага мерыдыяна пры вызначэнні геагр. даўгаты), пры геад. і картаграфічных работах.

Асаблівасці мех. Х.: свабодны (хранаметрычны) спуск, які забяспечвае дакладнасць ходу; біметал. разразны вобад кола балансу, што дазваляе захоўваць пастаянны перыяд вагання балансу пры змене т-ры; спец. прыстасаванне для выраўноўвання моманту завадной спружыны. Каб пазбегнуць уплыву вібрацый (амартызацыі), Х. устанаўліваюць на спец. прыстасаванні (напр., марскія Х. — на карданным падвесе, які забяспечвае гарыз. становішча Х. пры гайданцы). У 1970-я г. пашырыліся электронна-мех. і электронныя кварцавыя Х. (гл. *Электронны гадзіннік*), якія не патрабуюць амартызацыі, бо не маюць рухомых элементаў. Схема іх прыкладна такая, што і ў *кварцавых гадзінніках*. Забяспечваюць дакладнасць да дзесятых доляў секунды за суткі.

ХРАПАВІ́ЦКІ Ігнат Яўстахавіч (31.7.1817, в. Каханавічы Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. — 25.12.1893), бел. фалькларыст, грамадскі дзеяч. З роду *Храпавіцкіх*. Пісаў на польскай мове. У 1840-я г. супрацоўнічаў у альманаху *«Рубон»* (першы нумар якога адкрываўся вершам Х. «Дзвіна»), дзе надрукаваў працу «Погляд на паэзію беларускага народа» (1845; з дадаткам назіранняў над асаблівасцямі бел. мовы на матэрыяле гаворкі Віцебшчыны) — першую гісторыка-параўнальную характарыстыку бел. фальклору, вершы «Баркарола», «Восень» і інш., пераклады на польскую мову бел. нар. песень, гіст. дакументы. Рыхтаваў да друку «Поўны беларускі песнязбор», для якога распрацаваў класіфікацыю, назапашваў тэксты. У 1850 разам з С.Убры і Ю.Шчытом распрацаваў праект скасавання прыгоннага права і правёў яго на губ. дваранскім з'ездзе. З 1880 маршалак у Віцебскай губ., быў чл. Віцебскага губ. стат. к-та, губ. папячыцельства дзіцячых прытулкаў, узначальваў Віцебскае т-ва сельскіх гаспадароў.

Літ.: Салавей Л. Ігнат Храпавіцкі — беларускі фалькларыст // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1976. № 4; Каханоўскі Г.А., Малаш Л.А., Цвірка К.А. Беларуская фальклярыстыка: Эпоха феадалізму. Мн., 1989. *Л.М.Салавей.*

ХРАПАВІ́ЦКІ Мацвей Яўграфавіч (20.8.1784—12.4.1847), расійскі ваен. і дзярж. дзеяч. З роду *Храпавіцкіх*. Ген.-ад'ютант (1816). Ген. ад інфантэрыі (1831). Удзельнік Італьянскага і Швейцарскага паходаў 1799. У вайну 1812 камандаваў гвардз. брыгадай, вызначыўся ў час Барадзінскай бітвы. Удзельнічаў у замежных паходах 1813—14. У 1818—30 камандзір 3-й грэнадзёрскай дывізіі. З 4.1.1831 віленскі і гродзенскі ваен. губернатар. За нерашучасць дзеянняў у час падаўлення паўстання 1830—31 3.9.1831 звольнены з пасады. З 1832 камандуючы Грэнадзёрскім корпусам, з 1833 чл. Ваен. савета. З 1846 пецярбургскі ваен. губернатар, з 1833 чл. Дзярж. савета і К-та міністраў. *А.М.Лукашэвіч.*

ХРАПАВІ́ЦКІ Ян Антоній (1.10.1612, в. Падбярэззе каля Віцебска — 3.11.1685), дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай, аўтар дзённіка. З роду *Храпавіцкіх*. Скончыў калегіум Навадворскіх у Кракаве, вучыўся ў Лейдэне і Падуі. У 1637 перайшоў з кальвінізму ў каталіцтва, што дало яму магчымасць займацца грамадскай і паліт. дзейнасцю і зрабіць кар'еру. Смаленскі харунжы з 1650, падкаморы з 1660, ваявода віцебскі з 1669; староста дарагабужскі, азярыцкі, маркаўскі, адміністратар Магілёўскай эканоміі ў 1684. Сакратар караля Яна II Казіміра Вазы. Актыўны ўдзельнік паліт. жыцця Рэчы Паспалітай, удзельнічаў у працы 24 соймаў (на 17 быў абраны паслом), маршалак соймаў 1665 і 1668, выбіраўся ў Скарбовы трыбунал ВКЛ. У 1640—50-х г. удзельнічаў у працы камісіі па размежаванні Веліжскай і Усвяцкай валасцей з Невельскай, па выплаце даўгоў смаленскаму гарнізону і войску ВКЛ. З 1661 удзельнічаў у мірных перагаворах з Расіяй, у падпісанні *Андросаўскага перамір'я 1667*, у перагаворах 1674, 1677—78. Пакінуў дзённік за 1656—85 — каштоўную крыніцу, дзе ёсць звесткі пра паліт. жыццё Рэчы Паспалітай, соймы, паўсядзённае жыццё шляхты, іх звычаі і норавы. Упершыню ўрыўкі з дзённіка пад назвай «Збор цікавых звестак часоў панавання Яна Казіміра і Міхала Вішнявецкага» апублікаваны М.Стацэвічам у Вільні ў 1787. Фрагменты за 1668—72 выдадзены Ю.Русецкім у 1845, а за 1656—69 — Т.Васілеўскім у 1978—88. *В.С.Пазднякоў.*

Я.А.**Храпавіцкі**.

ХРАПАВІ́ЦКІЯ, Данілавічы-Храпавіцкія, шляхецкі род герба «Газдава» ў ВКЛ і Расіі. Родапачынальнік Фёдар Данілавіч — віцебскі харунжы (з 1562) і падкаморы (з 1576); у 1-й пал. 16 ст. ажаніўся з Аленай Сямёнаўнай і ў пасаг за ёю атрымаў маёнтак Храпавічы (Віцебскі пав.), ад назвы якога ўтворана прозвішча. Імя па бацьку Фёдара ў далейшым прадстаўнікі роду выкарыстоўвалі ў якасці прыдомка. З сярэдзіны 17 ст. адна лінія роду Х. у Расіі. Найб. вядомыя:

Іван Фёдаравіч, сын Фёдара Данілавіча, харунжы віцебскі з 1589. У шлюбе з Аленаю Глябовіч меў 5 сыноў, ад якіх пайшоў разгалінаваны род. Ян Антоній (1.10.1612—3.11.1685), сын Крыштофа, стольніка віцебскага, гл. *Храпавіцкі* Я.А. Францішак (1614—25.4.1685), брат Яна Антонія. У 1638 уступіў у манаскі ордэн бернардзінцаў. Выкладаў у навуч. установах ордэна ў Вільні, Гродне, узначальваў кляштары ў Сапежыне (Друі) і Будзе. У 1677—80 кіраўнік Малапольска-Літоўскай правінцыі ордэна. Крыштоф Антоній (?—1703), сын Яна Антонія. Пасол на соймы 1690 і інш., дэпутат Скарбовага трыбунала ВКЛ у 1673, каштэлян смаленскі прыкладна з 1695. Юзаф (1731—5.3.1801), сын Дамініка, шамбеляна караля Аўгуста III (1749), ген.-маёр войска ВКЛ (1762). У 1764—82 выбіраўся паслом на соймы, суддзя земскі смаленскі з 1775, з 1782 чл. Скарбовага дэпартамента Пастаяннай рады, у 1784—86 чл. Дэпартамента замежных спраў і адначасова маршалак

Пастаяннай рады, кашталян мсціслаўскі ў 1786—92. Антоній (?—1760), падкаморы смаленскі з 1750, паручнік пяцігорскі войска ВКЛ (1755), рэгіментар Бел. дывізіі войска ВКЛ у 1760. Яўстахій Юзаф (?—1791), сын Дамініка. Войскі полацкі, харунжы гусарскі войска ВКЛ (1750), пасол на соймы 1764, 1778, старадубскі падстароста з 1765, харунжы, староста з 1774, пісар Трыбунала ВКЛ у 1752—53, 1762—63, падваявода полацкі з 1774, шамбялян Станіслава Аўгуста Панятоўскага (1778), інстыгатар ВКЛ у 1779—83. Мікалай Саба, сын Антонія. Паручнік пяцігорскі войска ВКЛ, пасол на соймы 1754, 1760, 1766, рэгіментар Бел. дывізіі войска ВКЛ з 1762, аршанскі маршалак у 1771 і кашталян з 1793. Падпісаў Віленскі акт *паўстання 1794*, уваходзіў у склад *Найвышэйшай літоўскай рады*. Антоній, сын Мікалая Сабы. Маршалак аршанскі (пасля 1772), староста старадубскі. Пасол на Чатырохгадовы сойм 1788—92, належаў да Т-ва сяброў Канстытуцыі 3 мая 1791. Юзаф (?—25.2.1812), сын Яўстахія Юзафа. Староста старадубскі з 1781, інстыгатар ВКЛ у 1783—92, шамбялян караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага (1783), маршалак дваранства Полацкай губ. Антоній (1779—1851), сын Юзафа. У 1790—1801 у арміі Рас. імперыі. У вайну 1812 падтрымліваў Напалеона I, быў чл. ваеннага к-та *Часовага ўрада Вялікага княства Літоўскага*, муніцыпальнай рады Вільні, гал. камандзірам жандармерыі Віленскага дэпартамента. Пасля паражэння Напалеона разам з Часовым урадам выехаў у Варшаву, пасля ў Кракаў. З 1814 чл. Віленскай часовай губ. выканаўчай камісіі, узначальваў крымінальны дэпартамент Віленскага гал. суда, старшыня Віленскага т-ва дабрачыннасці. Уваходзіў у масонскія ложы. Аляксандр Васілевіч (18.3.1749—10.1.1802), сын Васіля Іванавіча. Рас. дзярж. дзеяч. Скончыў Сухапутны шляхецкі корпус. З 1766 служыў у арміі, з 1775 у Сенаце, у 1783—93 статс-сакратар Кацярыны II, з 1793 сенатар, правадз. тайны саветнік (1801). Аўтар літ. твораў, у т.л. «Памятных запісак» за 1782—93.

З рас. лініі найб. вядомыя:

Мацвей Яўграфавіч (20.8.1784—12.4.1847), рас. ваенны дзеяч (гл. *Храпавіцкі* М.Я.). Янсан Сямёнавіч (1785—1851), рас. ваенны дзеяч, ген.-маёр (1820), правадз. стацкі ваенны саветнік (1821). З 1801 у арміі. Удзельнік рас.-франц. войнаў 1805, 1806—07, рас.-туэцкай вайны 1806—12. У вайну 1812 камандаваў 2-м Укр. казацкім палком, праследаваў напалеонаўскую армію ад Барысава да Нёмана. Камендант Вільні. Удзельнічаў у замежных паходах 1813—14. Смаленскі цывільны губернатар у 1821—29, смаленскі губ. маршалак з 1838. Ігнат Яўстахавіч (12.8.1817—6.1.1894), сын Яўстахія Іосіфавіча, бел. фальклярыст, гл. *Храпавіцкі* І.Я.

У.М.Вяроўкін-Шэлюта, А.У.Ерашэвіч.

ХРАПАВЫ́ МЕХАНІ́ЗМ, механізм для пераўтварэння зваротна-вярчальнага руху рычага (каромысла) у перарывісты вярчальны рух храпавага кола (з зубцамі спец. формы). Рух рычага перадаецца храпаваму колу прамежкавым звяном, якое паварочвае кола толькі ў адным напрамку. Х.м. выкарыстоўваюць у грузападымальных машынах, у механізмах аўтам. ліній, станках, веласіпедах і інш.

ХРАПТО́ВІЧ (Літавор-Храптовіч) Іаахім Ігнацы Юзаф (4.1.1729, в. Ясянец Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. — 4.3.1812), дзяржаўны, навук. і культ. дзеяч ВКЛ. З роду *Храптовічаў*. Вучыўся ў Нясвіжскім калегіуме, Віленскай акадэміі, у Брунсбергу. Напачатку служыў у войску. У 1752—64 стольнік навагрудскі; выбіраўся дэпутатам Трыбунала ВКЛ у 1753, 1765 (яго маршалак). З 1764 вял. сакратар ВКЛ, з 1773 падканцлер ВКЛ, у 1793 прызначаны канцлерам ВКЛ (адмовіўся); у 1791—92 чл. Пастаяннай рады, міністр замежных спраў Рэчы Паспалітай. У Адукацыйнай камісіі кіраваў дэпартаментам школ ВКЛ (у яе складзе да 1792). Адзін з заснавальнікаў Варшаўскага т-ва сяброў навук. Прыхільнік фізіякратызму (гл. *Фізіякраты*); у сваіх працах «Аб штогадовым нацыянальным узнаўленні» (1802), «Аб натуральным праве» (1814) развіваў ідэі адзінства і ўзаемазалежнасці законаў прыроды і грамадства, асветніцкага гуманізму і маральнага ўдасканалення асобы. Лічыў, што пры належнай арганізацыі грамадскага жыцця ў адпаведнасці з «натуральным парадкам» рэчаў можна забяспечыць высокі ўзровень вытв-сці, найперш с.-г., і дабрабыту грамадзян, стварыць спрыяльныя ўмовы для развіцця іх прыродных задаткаў і здольнасцей, усталяваць у адносінах паміж людзьмі прынцыпы свабоды, сац. справядлівасці і гуманізму. Аўтар вершаў на польскай мове, арт. «Паэзія» (1781), «Памяткі пра род Літавораў...» (апубл. 1890—91), артыкулаў на с.-г. тэмы. У сваім маёнтку ў Шчорсах (цяпер вёска ў Навагрудскім р-не) пабудаваў палац (гл. *Шчорсаўскі палацава-паркавы комплекс*), школу, уніяцкую царкву, заснаваў б-ку (гл. *Храптовічаў бібліятэка*).

Літ.: Спірыдонаў М. Апошні канцлер Вялікага княства Літоўскага // Спадчына. 2001. № 1/2. *М.Ф.Спірыдонаў.*

ХРАПТО́ВІЧАЎ БІБЛІЯТЭ́КА. Існавала з 2-й пал. 18 ст. да пач. 20 ст. ў маёнтку Шчорсы (цяпер вёска ў Навагрудскім р-не Гродзенскай вобл.). Засн. І.Л.Храптовічам, які збіраў кнігі ў час падарожжаў па Еўропе. Калекцыя еўрап. выданняў 16—17 ст. набыта з б-кі рымскага кардынала І.Імперыяле. Пасля 1768 набыты кнігазбор заснавальніка Варшаўскай публічнай б-кі біскупа Ю.Залускага. Папоўнілася за кошт збораў з закрытых кляштараў. Пасля смерці І.Храптовіча (1812) кнігазбор перайшоў да яго сына Адама, які папоўніў б-ку старадрукамі і новымі выданнямі. Затым кнігазбор належаў яго пляменніку Міхаілу, ад якога б-ка перайшла да нашчадкаў, уладальнікаў Шчорсаў, якія яе ўпарадкавалі, а гісторык С.Л.Пташыцкі склаў і выдаў каталог. Налічвала больш за 10 тыс. экз. (паводле інш. звестак — каля 20 тыс.), у т.л. творы ант. аўтараў, франц. і італьян. класічнай л-ры, працы па гісторыі Польшчы, Беларусі і Літвы, рукапісы. У б-цы працавалі даследчыкі І.Лялевель, Я. і А. Снядэцкія, У.Сыракомля, яе наведваў А.Міцкевіч; бібліятэкарам у ёй працаваў Я.Чачот. У 1913 б-ка перададзена на часовае захоўванне Кіеўскаму ун-ту з умовай, што з адкрыццём ун-та на радзіме яна будзе вернута. Але гэтага не адбылося. Асн. частка Х.б. зберагаецца ў Цэнтр. навук. б-цы АН Украіны ў Кіеве (улічана 2005 экз.). Значная колькасць кніг страчана.

Літ.: Пташицкий С.Л. Щорсовская библиотека графа Литавора Хрептовича: Краткие сведения о собрании рукописей. М., 1899; Цыбуля В.А. Прыватная бібліятэка Храптовічаў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1973. № 3. *Т.І.Рошчына, А.П.Фурс.*

ХРАПТО́ВІЧЫ, Храбтовічы, магнацкі род герба «Адравонж» у ВКЛ. Родапачынальнік — баярын Багдан (15 ст.). У 16 ст. Х. перайшлі з праваслаўя ў каталіцтва. Адна галіна роду — нашчадкі Івана Багданавіча — карысталася прозвішчам Літавор-Храптовічы (ад мянушкі Івана), другая — нашчадкі Багдана Марцінавіча — Храптовічы-Багурынскія (ад в. Багурын на Валыні). У 16 ст. Х. мелі маёнткі ў Новагародскім, Лідскім, Гродзенскім пав., на Валыні, у 17 ст. — таксама ў Віцебскім пав., Полацкім ваяв., у 18 ст. валодалі Бешанковічамі і Глыбокім. Асн. маёнткі роду ў 19 — пач. 20 ст. — Шчорсы ў Навагрудскім пав. і Вішнева ў Ашмянскім пав. З сярэдзіны 18 ст. карысталіся графскім тытулам, які ў 1843 прызнаны і ў Рас. імперыі. Пасля смерці ў 1891 апошняга прадстаўніка графскай галіны роду па мужчынскай лініі Міхаіла Ірынеевіча Х. прозвішча і тытул перайшлі да яго пляменнікаў — прадстаўнікоў роду Буцянёвых, якія пачалі звацца Храптовічамі-Буцянёвымі. Галіна Храптовічаў-Багурынскіх згасла на Валыні ў 1757, яе гродзенская лінія — у 1890, лідская лінія існавала на пач. 20 ст. Найб. вядомыя:

Іван Багданавіч (Івашка, мянушка Літавор; ?—1513), падскарбі дворны ВКЛ у 1482—92, маршалак гаспадарскі ў 1492—1500, 1509—13; намеснік уцянскі ў 1489, слонімскі ў 1492, новагародскі ў 1499, драгічынскі ў 1512, кобрынскі ў 1513. Быў паслом у Польшчу і Маскву. У *бітве на Вядрошы 1500* узяты ў палон, дзе знаходзіўся да 1509. Фёдар Багданавіч (Федзька; ? — каля 1522), падскарбі дворны ў 1494, падскарбі вялікі ў 1500—09; намеснік беліцкі ў 1502, берасцейскі ў 1507, астрынскі ў 1507—09. За ўдзел у *Глінскіх мяцяжы 1508* пазбаўлены

Схема **храпавога механізма**: 1 — храпавое кола; 2 — сабачка; 3 — злучальнае звяно; 4 — дадатковы сабачка.

пасад і ў 1509—11 зняволены. Марцін Багданавіч (?—1526), канюшы дворны ў 1495—1509, падскарбі дворны ў 1502—04, лоўчы ВКЛ у 1505—09; намеснік зблянскі з 1497, жалудоцкі з 1501. За ўдзел у змове Глінскіх пазбаўлены пасад і ў 1509—11 зняволены. Канюшы троккі і маршалак гаспадарскі з 1524. Васіль Багданавіч (? — пасля 1528), намеснік уладзімірскі і ждолбіцкі ў 1495—1513. Юрый Фёдаравіч (у манастве Герман; ?—1558), сын Фёдара Багданавіча. Дваранін гаспадарскі ў 1541, з 1551 архіепіскап полацкі, віцебскі і мсціслаўскі. Мялецій (? — студз. 1593), сын Івана Алёхнавіча. Манах Кіева-Пячэрскага манастыра, яго архімандрыт з 1572. Пры падтрымцы кароля Стафана Баторыя ў 1580 абраны епіскапам уладзіміра-берасцейскім. У 1590 дазволіў мяшчанам Брэста ўтварыць брацтва пры царкве св. Міхалая і адкрыць школу на ўзор львоўскай брацкай. Да царк. уніі ставіўся непрыхільна. Юрый Адамавіч (1586, мяст. Вішнева Ашмянскага пав. — 1650), сын Адама Іванавіча. Кашталян смаленскі ў 1639—43 і жамойцкі ў 1643—45, ваявода парнаўскі ў 1645—46 і новагародскі з 1646. Марцыян (1698, в. Шчорсы Новагародскага пав. — 17.4.1766), сын Міхала, староста вярбельскі. Ян (1703—65), сын Міхала. Стольнік навагрудскі з 1731, кашталян брэсцкі ў 1752—56 і навагрудскі з 1756, пасол на соймы. Кароль (? — пасля 1794), сын Якуба. Пісар земскі гродзенскі з 1746, прыхільнік К.С.Радзівіла Пане Каханку, маршалак Радамскай канфедэрацыі ў Гродзенскім пав. У 1767 выступіў з маніфестам супраць гвалтаў рас. пасланніка М.В.Рапніна. Удзельнічаў у Барскай канфедэрацыі. У 1772—74 у эміграцыі. У 1781—86 харунжы надворны ВКЛ, з 1786 староста гродзенскі. Іаахім Ігнацы Юзаф (4.1.1729—4.3.1812), сын Марцыяна. Гл. *Храптовіч* І.І.Ю. Адам (25.3.1768—25.12.1844), сын Іаахіма Ігнацыя Юзафа. Пасол на Чатырохгадовы сойм 1788—92. Удзельнік паўстання 1794. Актыўна папаўняў старадрукамі і віленскімі выданнямі 19 ст. *Храптовічаў бібліятэку*. Міхаіл Ірынеевіч (30.6.1809—15.2.1891), сын Ірынея Іаахімавіча. З 1830 у мін-ве замежных спраў, у 1835 і 1840—43 на дыпламат. службе ў Лондане, з 1843 у Неапалі (з 1847 пасланнік), з 1853 пасланнік у Бельгіі, а ў 1856—58 — у Вялікабрытаніі; з 1877 чл. Дзярж. савета. *А.П.Грыцкевіч.*

ХРАСТКО́ВЫЯ РЫ́БЫ (Chondrichthyes), клас рыб. Вядомы з сярэдняга дэвону. 2 сучасныя падкл.: пласцінашчэлепныя (Elasmobranchii) з 2 надатр. (*акулы* і *скаты*) і злітначарапныя, або суцэльнагаловыя (Holocephali), з 1 атр. *хімеры*. Каля 140 сучасных родаў, 630 відаў. Жывуць пераважна ў морах, некат. — у прэсных водах. На Беларусі выяўлены рэшткі вымерлых пласцінашчэлепных Х.р.

Даўж. ад 6 см да 20 м. Шкілет храстковы, часта абвапнаваны. Скурных касцей няма. Целы пазванкоў і рэбры ёсць або адсутнічаюць. Луска зубападобная (плакоідная). Лопасці плаўнікоў падтрымліваюцца эластычнымі ніцямі. 5—7 (у некат. 4) шчэлепных адтулін, прыкрытых скурнай складкай, якія адкрываюцца вонкі. Плавальнага пузыра няма. Кішэчнік са спіральным клапанам; у сэрцы ёсць артэрыяльны конус. Апладненне ўнутранае. Спароўвальныя органы самцоў (птэрыгаподы) парныя, развіваюцца з брушных плаўнікоў. Жывародныя (рэдка), яйцажывародныя або адкладваюць яйцы. Большасць драпежнікі. Іл. гл. да арт. *Акулы*, *Скаты*, *Хімеры*.

ХРДЛІ́ЧКА, Грдлічка (Hrdlička) Алеш (29.3.1869, г. Гумпалец, Чэхія — 5.9.1943), амерыканскі антраполаг (па паходжанні чэх). З 1903 супрацоўнік, у 1910—42 кіраўнік аддзела фіз. антрапалогіі і Нац. музея ЗША у Вашынгтоне. Заснавальнік Амер. асацыяцыі антраполагаў і час. «American journal of physical anthropology» («Амерыканскі часопіс фізічнай антрапалогіі», 1918). Асн. працы па пытаннях паходжання і эвалюцыі чалавека, першапач. засялення Амер. кантынента. Яго шматлікія даследаванні плямён індзейцаў Паўн. і Паўд. Амерыкі, а таксама насельніцтва Алеуцкіх і Камандорскіх а-воў пацвердзілі тэорыю азіяцкага паходжання карэннага насельніцтва Паўн. Амерыкі. Аўтар тэорыі, у адпаведнасці з якой чалавецтва ў сваёй эвалюцыі прайшло праз стадыю неандэртальцаў (1927).

ХРЖАНО́ЎСКІ Андрэй Юр'евіч (н. 30.11.1939, Масква), расійскі кінарэжысёр-аніматар. Засл. дз. маст. Расіі (1992). Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1962). З 1962 на кінастудыі «Саюзмультфільм», заснавальнік Школы-студыі «ШАР» (Школа аніматараў і рэжысёраў). Першы фільм «Жыў-быў Казявін» (1966). Яго работам уласцівы спалучэнне анімацыі, камп'ютэрнай графікі і элементаў дакумент. і ігравога кіно, метафарычна ўмоўнага паэт. і сатыр. пачаткаў, сувязь з паэзіяй і жывапісам, тонкасць і выразнасць пластычнай формы: «Шкляны гармонік» (1968), «Шафа» (1971), «Матылёк» (1972), «У свеце баек» (1973), «Дом, які пабудаваў Джэк» (1976), пушкінская трылогія («Я да Вас лячу ўспамінам», 1977; «І зноў з Вамі я», 1981; «Восень», 1982; гал. прыз Усесаюзнага кінафестывалю, 1983), «Каралеўскі бутэрброд» (1985), «Пейзаж з ядлоўцам» (1987, з В.Угаравым), «Школа прыгожых мастацтваў» (1990), «Леў з сівой барадою» (1994), «Доўгае падарожжа», «Алег Каган. Жыццё пасля жыцця» (абодва 1997), «Паўтара ката» (2002) і інш. Піша сцэнарыі. Дзярж. прэмія Расіі 1986.

ХРОМ (лац. Chromium), Cr, хімічны элемент VI групы перыяд. сістэмы, ат. н. 24, ат. м. 51,996. Прыродны Х. складаецца з 4 стабільных ізатопаў з масавымі лікамі 50, 52—54; найб. пашыраны ^{52}Cr (83,79%). У зямной кары $3{,}5\cdot10^{-2}$% па масе. Важнейшыя мінералы: храміт $FeCr_2O_4$, магнахраміт (Mg, Fe)Cr_2O_4, алюмахраміт Fe(Cr, Al)$_2$. Адкрыты ў 1797 франц. хімікам Н.Л.Вакленам; назва ад грэч. chrōma колер, фарба (з-за яркай афарбоўкі злучэнняў Х.).

Блакітнавата-серабрысты метал, $t_{пл}$ 1890 °С, $t_{кіп}$ 2680 °С, шчыльн. 7190 кг/м^3. Хімічна мала актыўны. Растварацца ў салянай і разбаўленай сернай к-тах. У звычайных умовах устойлівы ў паветры, пры т-ры ~300 °С згарае ў кіслародзе з утварэннем сесквіаксіду Cr_2O_3 (гл. *Хрому аксіды*). Пры награванні ўзаемадзейнічае з галагенамі, азотам, вугляродам, серай. Утварае шматлікія комплексныя злучэнні. Выкарыстоўваюць Х. як кампанент нержавейных, кіслотатрывалых сталей і інш. сплаваў; парашковы Х. — у вытв-сці матэрыялаў для зварачных электродаў; злучэнні Х. як вогнетрывалыя і магн. матэрыялы, пігменты і інш.

Літ.: Салли А.Г., Брэндз Э.А. Хром: Пер. с англ. 2 изд. М., 1971. *А.П.Чарнякова.*

ХРОМАВАКІ́СЛЫЯ СО́ЛІ, тое, што *храматы*.

ХРО́МАВАЯ СУ́МЕСЬ, сумесь насычанага воднага раствору дыхрамату калію ($K_2Cr_2O_7$) і канцэнтраванай сернай кіслаты (H_2SO_4) у роўных аб'ёмах. Моцны акісляльнік. Выкарыстоўваюць для мыцця шкляного хім. посуду. Гл. таксама *Дыхраматы*.

ХРО́МАВЫ ГАЛЫ́Н, крышталегідраты двайных солей $MCr(SO_4)_2\cdot12H_2O$, дзе M — аднавалентны катыён (напр., калій K^+, натрый Na^+).

Крышталі цёмна-фіялетавага колеру, $t_{пл}$ 89 °С, шчыльн. 1840 кг/м^3. Добра растваральныя ў вадзе. Атрымліваюць змешваннем гарачых растворaў сульфатаў шчолачных металаў або амонію з $Cr(SO_4)_3$ з наступнай крышталізацыяй. Выкарыстоўваюць пры дубленні скур (адсюль назва скуры «хром»), у тэкст. прам-сці (пратрава пры фарбаванні тканін), у фатаграфіі.

ХРО́МАВЫЯ КІСЛО́ТЫ, кіслоты агульнай ф-лы $n\ CrO_3H_2O$ (n = 1—4). У свабодным стане не вылучаны. Найважн. хромавая H_2CrO_4 і дыхромавая $H_2Cr_2O_7$ кіслоты.

Моцныя двухасноўныя к-ты, якія існуюць толькі ў водных растворах (цалкам дысацыіруюць на першай ступені). Солі Х.к. — *храматы* і *дыхраматы*. Атрымліваюць Х.к. растварэннем трыаксіду хрому (гл. *Хрому аксіды*) у вадзе. Выкарыстоўваюць растворы H_2CrO_4 пры электралітычным храміраванні і атрыманні хрому электролізам. Атрутныя, выклікаюць цяжкія апёкі скуры, дэрматыты і язвы. *А.П.Чарнякова.*

ХРО́МАВЫЯ РУ́ДЫ, храміты, прыродныя мінеральныя ўтварэнні (мінералы, горныя пароды), якія выкарыстоўваюцца для прамысл. здабычы *хрому*. Гал. мінералы: *хромшпінеліды* і сілікаты (*серпенцініт*, *хларыты* і інш.). Змяшчаюць аксіду хрому ў мінералах 2—67%. Прамысл. значэнне маюць руды, у якіх аксіду хрому болей за 25—30%.

Храміт.

Радовішчы магматычныя (у пародах асн. і ультраасн. саставу) і россыпныя. Х.р. выкарыстоўваюцца як сыравіна для ферахрому, у выт-сці чыгуну павышанай трываласці, вогнетрывалых матэрыялаў і хромавых солей. Асн. запасы Х.р. у свеце знаходзяцца ў масіве Бушвелдскі комплекс у Паўд.-Афр. Рэспубліцы, ёсць радовішчы ў Зімбабве, Індыі, Турцыі, Расіі, на Філіпінах, у Фінляндыі, Іране, Канадзе, Бразіліі і інш.

ХРО́МАВЫЯ СПЛА́ВЫ, сплавы на аснове *хрому*. Вызначаюцца высокай т-рай плаўлення (1900 °С), гарачаўстойлівасцю, каразійнай стойкасцю ў агрэсіўных вадкіх і газавых асяроддзях, невял. шчыльнасцю (720 кг/м^3). Выкарыстоўваюцца для вырабу гарачаўстойлівых дэталей аднаразовага дзеяння, полымных экранаў, мацавальных дэталей, якія працуюць пры т-рах 1000—1200 °С, таксама каналаў хім. установак.

ХРОМАЛІТАГРА́ФІЯ (ад *храма...* + *літаграфія*), каляровая літаграфія, якая выконваецца на некалькіх камянях (або цынкавых пласцінах), колькасць якіх звычайна адпавядае колькасці фарбаў. У адбітку магчыма накладванне адной фарбы на другую з утварэннем прамежкавых колеравых тонаў.

ХРО́МУ АКСІ́ДЫ, злучэнні *хрому* з кіслародам. Вядомы монааксід CrO, сесквіаксід Cr_2O_3, дыаксід CrO_2, трыаксід CrO_3 і інш. Найб. пашыраны Cr_2O_3 і CrO_3.

Аксід хрому, ці сесквіаксід — цёмна-зялёныя крышталі (у прыродзе мінерал эскалаіт), $t_{пл}$ 2334 °С, $t_{кіп}$ 3000 °С. Хімічна малаактыўны. Не раствараецца ў вадзе. Раствараецца ў моцных к-тах пры награвanні. Атрымліваюць тэрмічным раскладаннем дыхраматаў амонію $(NH_4)_2Cr_2O_3$ і трыаксіду хрому, гартаваннем *дыхраматаў* (натрыю або калію) з вугалем. Выкарыстоўваюць як паліравальны матэрыял, пігмент, каталізатар арган. сінтэзу, для атрымання метал. хрому і яго карбідаў. Трыаксід хрому, ці хромавы ангідрыд CrO_3 — чырв. крышталі. Гіграскапічны, добра раствараецца ў вадзе з утварэннем *хромавых кіслот*. Вельмі моцны акісляльнік. Атрымліваюць узаемадзеяннем $(NH_4)_2Cr_2O_7$ з канцэнтраванай сернай к-той. Выкарыстоўваюць для атрымання хрому, адбельвання маслаў, тлушчаў, парафіну і інш., як пратраву пры фарбаванні тканін, пігмент для керамікі, шкла і тумы. Атрутны, ГДК у атм. паветры 0,01 мг/м^3. *А.П.Чарнякова.*

ХРО́МЧАНКА Кузьма Рыгоравіч (н. 25.10.1929, пас. Калінаўка Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. літаратуразнавец і крытык. Канд. філал. н. (1958). Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1951). У 1951—53 настаўнічаў на Гродзеншчыне, з 1956 у Ін-це л-ры АН Беларусі, з 1966 у БДУ (з 1993 заг. кафедры). Друкуецца з 1957. Даследуе праблемы гісторыі бел. л-ры, пытанні тэксталогіі, маст. перакладу, літ. узаемасувязей. Аўтар манаграфій «Піліп Пестрак» (1960), «За шчасце зямное» (1966), літ.-крытычных артыкулаў. Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (т. 2, 1966).

Тв.: Беларуская мастацкая проза (канец XIX — пачатак XX ст.). Мн., 1979.

ХРОМШПІНЕЛІ́ДЫ, храміты, мінералы падкласа складаных аксідаў з групы *шпінелей*. Гал. руда на *хром*. Агульная формула $(Mg, Fe^{2+})(Cr, Al, Fe^{3+}, Ti)_2O_4$. Маюць Cr_2O_3 (да 75%), прымесі марганцу (да 24%), тытану, вальфраму, цынку, нікелю, кобальту і інш.

Паводле хім. саставу вылучаюць мінералы: храміт $FeCr_2O_4$, магнахраміт (Mg, Fe) Cr_2O_4, алюмахраміт $Fe(Cr, Al)_2O_4$, хромпікатыт (Mg, Fe) $(Cr, Al)_2O_4$ і інш. Крышталізуюцца ў кубічнай сінганіі. Утвараюць крышталі актаэдрычныя ці закругленыя няправільнай формы, часцей суцэльныя зярністыя агрэгаты. Колер бураваты, чорны. Цв. 5,5—7,5. Шчыльн. 4,2—5,1 г/см^3. Паходжанне магматычнае. Трапляюцца ў асн. і ультраасн. горных пародах (дунітах, перыдатытах, серпенцінітах). Радовішчы ў Расіі, Казахстане, на Кубе, ў Югаславіі, Паўд.-Афр. Рэспубліцы, Паўд. Радэзіі, Турцыі, ЗША, Новай Каледоніі. Гл. таксама *Хромавыя руды*.

ХРОНАБІЯЛО́ГІЯ, тое, што *біярытмалогія*.

ХРОНАМЕТРА́Ж (франц. chronométrage ад грэч. chronos час + metreo вымяраю), метад вывучэння і вызначэння выдаткаў *рабочага часу*. Выкарыстоўваецца для распрацоўкі нарматываў ці ўстанаўлення норм выдаткаў працы (гл. *Нарміраванне працы*).

Пры правядзенні Х. ў вытв. аперацыі вылучаюць элементы, што цыклічна паўтараюцца, фіксуюць змест і паслядоўнасць выканання працоўных прыёмаў, вызначаюць затраты часу, пачатку і заканчэння кожнага элемента. Бывае бесперапынны і выбарачны. Найчасцей выкарыстоўваюць фотахронаметраж (аднасамасова замяраюць і вывучаюць працягласць выканання асобных элементаў вытв. аперацыі, выдаткі рабочага часу за змену ці за яе частку).

ХРО́НІКА (грэч. chronika летапіс ад chronikos які адносіцца да часу), 1) гісторыка-літаратурны твор, у якім падзеі падаюцца ў часавай паслядоўнасці, адпаведна пэўнай гіст. канцэпцыі. У жанравых адносінах Х. больш завершаныя і цэласныя, чым *летапісы*. Яны ўзніклі ў глыбокай старажытнасці (Х. вавілонскія і кітайскія, кніга Хронік у складзе *Біблії* і інш.). У сярэдневяковай Х. — вядучы жанр гіст.-дакумент. прозы (Х. франц., ням., польскія, чэш.). У шэрагу зах.-еўрап. Х. часткова адлюстравана і гісторыя бел. зямель (*Лівонскія хронікі*, прускія Х.). Адзін з першых гіст.-літ. твораў, напісаных па-беларуску, — першая бел. Х. *«Летапісец вялікіх князёў літоўскіх»* (15 ст.). Яе традыцыі ў 16 ст. працягваліся ў *«Хроніцы Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага»*. Своеасаблівы сінтэз гіст. аповесцей з асобнымі пагадовымі запісамі, летапіснага і хранаграфічнага спосабаў апісання мінулага ў *«Хроніцы Быхаўца»*, на якой грунтуюцца бел.-літ. звесткі *«Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсяе Русі»* М.Стрыйкоўскага. Х. называюцца і некаторыя помнікі летапіснага жанру, творы з пагадовай формай выкладу (*Магілёўская хроніка*). Х. зрабілі значны ўплыў на гіст. прозу і драматургію новага часу. З імі генетычна звязаны дзённікі, мемуары. Гл. таксама *Летапісы беларускія*. 2) Літаратурны твор, у якім паслядоўна выкладаецца гісторыя грамадскіх, паліт. і інш. падзей, жыцця герояў (напр., «Генрых VI» У.Шэкспіра, «Хроніка царавання Карла IX» П.Мерымэ, «Камароўская хроніка» і «Віленскія камунары» М.Гарэцкага, «Палеская хроніка» І.Мележа і інш.). У бел. л-ры на матэрыяле «Хронікі Лівоніі» Генрыха Латвійскага (1224—27) часткова пабудаваны раман Л.Дайнекі «Меч князя Вячкі». 3) Газетна-часопісны і радыё-тэлевізійны жанр; кароткае паведамленне інфарм. характару пра бягучыя падзеі грамадскага жыцця.

В.А.Чамярыцкі.

ХРО́НІКА БЫХАЎЦА́, Летапіс Быхаўца, Быхаўца хроніка, трэці, найб. поўны агульнадзярж. летапісны звод ВКЛ. Выяўлена ў 1820-я г. ў б-цы А.Быхаўца, памешчыка з маёнтка Магілёўцы пад Ваўкавыскам. Пачатак і канец хронікі не збярагліся. Вядома ў адзіным спісе канца 17 — пач. 18 ст., перапісаным лацінкай з больш даўняга, кірылічнага тэксту. Рукапіс згублены ў 2-й пал. 19 ст. Крыніцамі Х.Б. паслужылі *«Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага»*, *Галіцка-Валынскі летапіс*, *Беларуска-Літоўскі летапіс 1446*. Аўтар зводу перанёс пачатак падзей з 1 у 5 ст., з часоў Нерона ў эпоху Вял. перасялення народаў і дапоўніў легендарную гісторыю Літвы аповесцю пра Міндоўга і Войшалка (запазычана з Галіцка-Валынскага летапісу). Бел.-літ. летапіс 1446 уключаны ў скарочаным выглядзе, без агульнарус. часткі і *«Пахвалы Вітаўту»*. Асн. крыніцамі арыгінальнай часткі, якая складае каля палавіны тэксту і ахоплівае падзеі пераважна 15 — пач. 16 ст., паслужылі розныя гіст. і сямейныя паданні, успаміны відавочцаў, уласныя назіранні аўтара. Да-



Хроніка Быхаўца. Старонка рукапісу.

мінуючая тэма — ваенна-патрыятычная. Шмат старонак аўтар прысвяціў апісанню паходаў і бітваў. Асаблівай жывасцю і літ. дасканаласцю вызначаюцца апавяданні пра адзін з паходаў Альгерда на Маскву, Грунвальдскую бітву 1410 і забойства вял. кн. Жыгімонта Кейстутавіча ў 1440. Твор абрываецца на апісанні перамогі войска ВКЛ пад кіраўніцтвам М.Глінскага над татарамі пад Клецкам у 1506. Асобныя старонкі хронікі маюць выразную публіцыст. накіраванасць. Прыкметна непрыязнае стаўленне аўтара да кіруючых колаў Польшчы, у якіх ён бачыў гал. ворагаў паліт. незалежнасці сваёй радзімы. Адначасова храніст высока ставіў ролю бел.-літ. феадалаў у гісторыі ВКЛ, у абароне яго дзярж. інтарэсаў. У Х.Б. выявіліся імкненні і погляды патрыятычна настроенай часткі мясц. шляхты, заклапочанай гіст. лёсам сваёй дзяржавы. Мова хронікі — узор старабел. літаратурнай пісьмовай мовы 16 ст. Асобныя дэталі зместу і гіст. рэаліі сведчаць пра тое, што асн. частка Х.Б. напісана беларусам правасл. веравызнання, блізкім да князёў Алелькавічаў. Як летапісны звод завершана, верагодна, у 1530-я г. Х.Б. — важная крыніца па сярэдневяковай гісторыі Беларусі і Літвы, каштоўны помнік грамадска-паліт. думкі бел.-літ. народаў, бел. мовы і л-ры эпохі Адраджэння. Паслужыла крыніцай *«Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсяе Русі»* М.Стрыйкоўскага, а праз яе — і апошняй (1611) рэдакцыі *«Хронікі Еўрапейскай Сарматыі»* А.Гваньіні, «Хронікі Польшчы» М. і І. Бельскіх, шэрагу інш. хронік і гісторый 17—19 ст., у т.л. бел.-ўкр. храніграфа *«Вялікая хроніка»*. Упершыню поўнасцю апублікавана ў 1846 Т.Нарбутам, перавыдадзена ў «Поўным зборы рускіх летапісаў» (т. 17, 1907; т. 32, 1975). Перакладзена на рус., літоўскую і сучасную бел. мовы.

Літ.: Беларускія летапісы і хронікі. Мн., 1997. *В.А.Чамярыцкі.*

«ХРО́НІКА ВЯЛІ́КАГА КНЯ́СТВА ЛІТО́ЎСКАГА І ЖАМО́ЙЦКАГА», гісторыка-літаратурны твор 16 ст., у якім выкладзена гісторыя ВКЛ ад легендарнага кн. Палемона да *Гедзіміна*. Напісана ў 1520-я г. на бел. мове, відаць, у Вільні ў асяроддзі літоўскіх (балцкіх) феадалаў. Яе 2-я і 3-я рэдакцыі ўзніклі ў сярэдзіне 16 ст. У аснову Хронікі пакладзена легенда пра паходжанне літ. князёў і шляхты ад рымскіх арыстакратаў. Яна літаратурна апрацавана, храналагічна прывязана да пэўных этапаў еўрап. гісторыі (пачатак падзей аднесены да часоў Нерона, 1 ст. н.э.), набыла выгляд гіст. аповесці пра сапраўдныя падзеі мінулага. Крыніцамі для яе паслужылі розныя гіст. паданні (пра паходы Гедзіміна на Украіну, бітвы з татарамі, пра мінулае Вільні, Полацка, Навагрудка, пра язычніцкія звычаі літоўцаў і інш.). *Беларуска-літоўскі летапіс 1446* і *Іпацьеўскі летапіс* выкарыстаны адвольна і тэндэнцыйна. У Хроніцы ўзвялічваецца і гераізуецца мінулае Літвы і прыніжаецца гісторыя Русі. Пададзеная з пазіцыі літ. феадалаў і маючы шмат фактычных недакладнасцей і свядомых скажэнняў пра гісторыю ўзнікнення ВКЛ, хроніка часам не стасуецца з сапраўднай гісторыяй. Створана з мэтай сцвердзіць вядучую ролю, пануючае становішча ў дзяржаве літ. феадалаў, абудзіць у іх пачуцці нац. гонару і патрыятызму. Напісана ў звязнай форме, вельмі бегла, месцамі схематычна. З літаратурнага боку найб. цікавае ў хроніцы паэтычнае апавяданне пра заснаванне Гедзімінам Вільні, пабудаванае на тапанімічнай легендзе, апрацаванай нар. фантазіяй. Хроніка распаўсюджвалася на Беларусі ў складзе 2-га аднайм. бел.-літ. летапіснага зводу, што ўзнік у выніку яе аб'яднання з *«Летапісцам вялікіх князёў літоўскіх»* і інш. часткамі Бел.-літоўскага летапісу 1446. Зберагласяся ў 3 рэдакцыях: кароткай (Летапіс Красінскага), пашыранай (гл. *Альшэўскі летапіс, Патрыяршы рукапіс, Румянцаўскі летапіс* і інш. спісы) і поўнай (Летапіс Рачынскага, *Еўраінаўскі летапіс*). Паслужыла непасрэднай крыніцай *Хронікі Быхаўца*, *«Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсяе Русі»* М.Стрыйкоўскага, *«Хронікі Еўрапейскай Сарматыі»* А.Гваньіні, некаторых інш. хронік і гісторый 16—19 ст. *В.А.Чамярыцкі.*

«ХРО́НІКА ЕЎРАПЕ́ЙСКАЙ САРМА́ТЫІ», помнік гістарыяграфіі эпохі феадалізму. Складзена А.*Гваньіні* ў 1-й пал. 1570-х г. на лац. мове. Засн. на розных крыніцах, у т.л. на бел.-літоўскіх хроніках. Аўтар выкарыстаў таксама матэрыялы, сабраныя М.*Стрыйкоўскім*. У творы апісваюцца Польшча, Беларусь, Літва, Украіна, Расія, Татарыя і інш. краіны, прыводзяцца звесткі з грамадз. гісторыі, геаграфіі, пра побыт, звычаі і культуру народаў Еўропы (напр., арт. «Спосаб узорвання глебы і сяўбы на Белай Русі» і інш.). Гісторыя ВКЛ выкладзена скарочана, пераважна паводле *«Хронікі Вялікага княства Літоўскага* і *Жамойцкага»* і *Хронікі Быхаўца*. Упершыню апублікавана ў 1578 у Кракаве; у 1581 у Спіры (Германія) выйшла 2-е, дапоўненае выданне; у 1583 надрукавана ў Італіі ў перакладзе на італьянскую мову. На Беларусі і Украіне была вядома ў выданні на польск. мове (Кракаў, 1611, непасрэднай крыніцай для гэтай рэдакцыі паслужыла *«Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі»* Стрыйкоўскага), якое дапоўнена кароткім апісаннем Зах. Еўропы, некат. краін Б. Усходу, а таксама падзей у Польшчы, ВКЛ і Расіі апошняй чвэрці 16 ст. У 1-й пал. 17 ст. перакладзена на бел. мову. Паслужыла крыніцай для бел. і ўкр. хронік і храніграфаў 17—18 ст. На яе спасылаецца Т.Сурта ў прадмове да *«Магілёўскай хронікі»*. «Х.Е.С.» — першы твор, які пазнаёміў зах.-еўрап. чытача з гісторыяй ВКЛ і зместам бел.-літоўскіх агульнадзярж. хронік. *В.А.Чамярыцкі.*

«ХРО́НІКА ЛІВО́НІІ», гістарычны твор ням. храніста *Генрыха Латвійскага*, напісаны ў 1224—27 на лац. мове. Гл. ў арт. *Лівонскія хронікі*.

«ХРО́НІКА ЛІТО́ЎСКАЯ І ЖАМО́ЙЦКАЯ», помнік беларуска-літоўскага летапісання 17 ст., 3-я частка *«Вялікай хронікі»*, дзе выкладзена сусв. гісторыя да канца 16 ст. Напісана на старабел. мове. Зместам блізкая да *Хронікі Быхаўца*, асабліва да *«Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсяе Русі»* М.Стрыйкоўскага, што была асн. крыніцай для яе складальніка. Прысвечана гісторыі ВКЛ ад міфічнага кн. *Палемона* да *Стафана Баторыя*. У творы падкрэсліваецца гіст. значэнне бел. горада Навагрудка як першай сталіцы княства, шмат увагі аддаецца ваен.-паліт. узаемаадносінам паміж ВКЛ і Расіяй. Адзіны помнік бел.-літоўскага летапісання, дзе змешчана аповесць пра Кулікоўскую бітву — «Сказанне пра Мамаева пабоішча». Побач з унікальнымі звесткамі ў хроніцы нямала гіст. недакладнасцей. Складзена, пэўна, у Паўд. Беларусі, магчыма, у Слуцку, чалавекам, блізкім да Радзівілаў (у хроніцы праслаўляецца іх род, паходжанне якога выводзіцца ад нашчадкаў рымскіх арыстакратаў). У складзе «Вялікай Хронікі» бытавала на Украіне і ў Расіі. Апублікавана М.М.Улашчыкам у «Поўным зборы рускіх летапісаў» (т. 32, 1975). *В.А.Чамярыцкі.*



«Хроніка літоўская і жамойцкая». Пецярбургскі спіс 18 ст.

«ХРО́НІКА ПО́ЛЬСКАЯ, ЛІТО́ЎСКАЯ, ЖАМО́ЙЦКАЯ І ЎСЯ́Е РУСІ́», помнік польскай гістарыяграфіі 16 ст. Складзена М.*Стрыйкоўскім* у 1570-я г. Упершыню апублікавана ў 1582 у Краляўцы (цяпер Калінінград). «Хроніка...» вылучаецца шырынёю ахопу падзей (ад біблейскіх часоў да 1580 уключна), багаццем выкарыстаных крыніц (творы антычных гісторыкаў Герадота, Ціта Лівія, Клаўдзія Пталамея, Страбона, польскіх храністаў *Я.Длугаша, Мацея з Мехава*, М.*Кромера*, М.*Бельскага*, крыжацкага храніста П.Дусбурга, стараж.-рус. і бел.-літоўскія летапісы). Апісвае паліт. гісторыю Польшчы, ВКЛ і Русі, закранае праблемы этнагенезу славян, сцвярджае адзінства іх паходжання, высока ацэньвае гіст. мінулае ўсх.-слав. народаў і літоўцаў, услаўляе іх гераічныя справы. Даволі падрабязна выкладзена гісторыя ВКЛ ад легендарнага кн. *Палемона* да *Стафана Баторыя*, пераважна паводле *«Хронікі Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага» і Хронікі Быхаўца*, што былі вядомы аўтару ў 15 спісах і выкарыстаны ім добрасумленна, але некрытычна; мае шмат недакладнасцей і адвольнасцей. «Хроніка...» змяшчае звесткі па гісторыі бел. культуры, пра помнікі археалогіі, архітэктуры, жывапісу Беларусі эпохі сярэдневякоўя. Характэрная асаблівасць помніка — наяўнасць значнай колькасці вершаваных уставак пра асобныя падзеі батальнай тэматыкі (пра бітвы з татарамі пад Клецкам у 1506, з рус. войскамі пад Оршай у 1514, пад Улай у 1564 і інш.), а таксама аўтарскія прысвячэнні розным бел.-літ. мецэнатам. Падзеі ў творы асветлены з агульнадзярж. і шляхецкіх пазіцый; мінулае бел. і літоўскага народаў паэтызуецца і гераізуецца. Сваім кампіляцыйным характарам, асаблівасцямі выкладу і жанравай формы «Хроніка...» нагадвае летапісны звод, апрацаваны пад белетрыстычную гіст. аповесць. Яна карысталася вял. папулярнасцю і аўтарытэтам на Беларусі, Украіне і Літве, была добра вядома ў Расіі, дзе неаднаразова перакладалася. Паслужыла непасрэднай крыніцай Хронікі Польшчы» І.*Бельскага*, апошняй (1611) рэдакцыі *«Хронікі Еўрапейскай Сарматыі»* А.Гваньіні, «Палінодыі» З.Капысценскага, «Сінопсіса» І.Гізеля, гіст. прац В.М.*Тацішчава*, Т.*Нарбута*, твораў інш. польск., укр., рас., літ. храністаў і гісторыкаў. На бел. мову перакладзена ў канцы 16 ст. — пач. 17 ст., лягла ў аснову *«Хронікі літоўскай і жамойцкай»*, 2-й і 3-й частак бел.-ўкр. хранографа *«Вялікая хроніка»*. *В.А.Чамярыцкі.*

Kiora przed-
tym mieyce Kro-
ná na wspod.

Kronika Bol
ſka Litewſka / Zmodzka / y wſzyſ-
kich Ruſi Kiiowſkich / Wołodimirſkich / Siewierſkich / Wol-
hińſkich / Podolſkich / Podgorſkich / Podliſkich / etc. Z rozmáite przypadki
woienne y domowe / Duchſkie / Xiążęcowſkie / Panowſkie / y wſzech dzie-
ſiątkow Polſkiemu y Litewſkiemu Xięſtwu Litewſkiemu przyſłuſzących /
Wedle dáiącego z gruntownego zgáſzenia pewnych bowodow i rozmái-
tych ſcyſtorikow y Zuiroſow poſtronnych / y domowych / y Zagranicznych / Xiąg
Kronikarſkich / Latopiſcow / Druſkich ſtarych / Kodeks cum modernis
ea mea ſedentyá Kronik / y Latopiſcow Ruſkich / Litewſkich / y DIVO-
SZA Oycá dzieiow Polſkich z wſzyſtkim / i ſpolu pilnością y wnetowáty
ſpoſob wſzyſtki Xiąząt / i Panow / ſo de wſzyſtkich
tego Xięſtwa z ſi ſ.

MACIEIA OSOSTEWICIVSA STRIY-
kowſkiego doſkonáłym páłaſtwu / zdrowiu / y máiętnościom ſzkodliwe /
ieden przedtym bowiem Páłeczkowſki Páłeczkowſkiemu / Stryikowſki
Stryikowſkiemu bowiem / y nadtym bowiem Stryikowſki Stryikowſkiemu
tego Xięſtwa z ſi ſ.

Z Xiąg y Pismienek Kro: J: M:

Drukowano w Królewcu w Gerzego Oſtarbergerá:

M. D. LXXXII.

Тытульны ліст першага выдання «Хронікі» М. Стрыйкоўскага.

«Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі» М.Стрыйкоўскага. Кралявец, 1582. Тытульны ліст.

«ХРО́НІКА ЎСЯГО́ СВЕ́ТУ», помнік польскай гістарыяграфіі 16 ст., гісторыка-літаратурная кампіляцыя, складзеная М.*Бельскім*. Прысвечана сусв. гісторыі ад антычных часоў да сярэдзіны 16 ст. Шмат увагі аддадзена біблейскай гісторыі, якая выкладзена паводле Старога запавету і Евангелля, стараж. гісторыі Грэцыі і Рыма, а таксама сярэдневяковай гісторыі Зах. Еўропы. Больш сцісла апісана гіст. мінулае славян. У канцы хронікі кароткае апісанне розных падарожжаў і вял. геагр. адкрыццяў. Гісторыя ВКЛ пададзена паводле «Гісторыі Польшчы» Я.*Длугаша*. Хроніка вызначаецца некрытычным стаўленнем аўтара да крыніц. У ёй шмат легендарных звестак, белетрызаванага апісання мінулага, літаратурнага матэрыялу. Упершыню апублікавана ў Кракаве ў 1551, у дапоўненым варыянце перавыдадзена ў 1554 і 1564. Карысталася папулярнасцю на землях усх. славян. Перакладзена на бел. (1560-я г.) і рус. мовы. Паслужыла непасрэднай крыніцай 3-й рэдакцыі *«Хронікі Вялікага княства Літоўскага* і *Жамойцкага»*, *«Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсяе Русі»* М.Стрыйкоўскага, бел.-ўкр. хранографа 17 ст. *«Вялікая хроніка»*. Адыграла станоўчую ролю ў пашырэнні агульнага кругагляду бел. чытачоў эпохі барока, задавальняла іх павышаную цікавасць да гіст. мінулага інш. краін і народаў, далучала да ант. гісторыі і міфалогіі, знаёміла з падзеямі і героямі сусв. гісторыі: Траянская вайна, подзвігі і прыгоды Аляксандра Македонскага (гл. *«Александрыя»*) і Скандэрбега (гл. *«Аповесць пра Скандэрбега»*), крыжовыя паходы, адкрыццё Калумбам Амерыкі і інш. *В.А.Чамярыцкі.*

ХРО́СНЫЯ БАЦЬКІ́, названыя (запрошаныя) бацькі, што прымаюць удзел у хрышчэнні (радзінах) дзіцяці; у адносінах да родных бацькоў апошняга (хросніка) яны называюцца *кумы*.

ХРЎКІН Цімафей Цімафеевіч (21.6.1910, г. Ейск Краснадарскага краю, Расія — 19.7.1953), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну. Ген.-палк. авіяцыі (1944). Двойчы Герой Сав. Саюза (1939, 1945). Скончыў Луганскую ваен. школу пілотаў (1939), курсы ўдасканалення вышэйшага камсаставу пры Ваен. акадэміі Генштаба (1941). У Чырв. Арміі з 1932. У 1936—37 удзельнік грамадз. вайны ў Іспаніі 1936—39; у 1938 добраахвотнікам змагаўся з яп. захопнікамі ў Кітаі.

Ц.Ц.Хрукін.

У сав.-фінл. вайну 1939—40 камандаваў ВПС 14-й арміі. У Вял. Айч. вайну камандуючы ВПС 12-й арміі, Карэльскага і Паўд.-Зах. франтоў, потым 8-й паветр. арміяй на Паўд.-Зах., Сталінградскім, 4-м Укр. франтах. З ліп. 1944 камандуючы 1-й паветр. арміяй, якая ў складзе 3-га Бел. фронту ўдзельнічала ў вызваленні Беларусі, Прыбалтыкі, ва Усх.-Прускай і інш. аперацыях. Пасля вайны на адказных пасадах у ВПС і войсках ППА краіны.

ХРУНО́Ў Яўген Васілевіч (10.9.1933, в. Пруды Валоўскага р-на Тульскай вобл., Расія — 19.5.2000), сав. касманаўт. Герой Сав. Саюза (1969). Лётчык-касманаўт СССР (1969). Канд. тэхн. н. (1971). Палкоўнік. Скончыў Батайскае ваен. авіяц. вучылішча (1956), Ваенна-паветр. інж. акадэмію (1968), Ваенна-паліт. акадэмію (1972). У 1960—80 у Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю.А.Гагарына. 15—17.1.1969 здзейсніў (як інжынер-даследчык) палёт на касм. караблях (КК) «Саюз-5» і «Саюз-4», у час якога з А.С.*Елісеевым* перайшоў праз адкрыты космас (37 мін) з КК «Саюз-5» (камандзір Б.В.*Валынаў*) у КК «Саюз-4» (камандзір У.А.*Шаталаў*), на якім вярнуўся на Зямлю. У космасе правёў 47 гадз 46 мін. Залаты медаль імя К.Э.Цыялкоўскага АН СССР.

Тв.: Покорение невесомости. М., 1976; На орбите вне корабля. М., 1977 (разам з Ю.М.Глазковым, Л.С.Хачатур'янцам); Оптические исследования в космосе. Л., 1979 (разам з А.І.Лазаравым, А.Р.Нікалаевым); Путь к Марсу. М., 1979 (разам з Л.С.Хачатур'янцам); На астероиде. М., 1984 (з ім жа); Здравствуй, Фобос! М., 1988 (з ім жа). *У.С.Ларыёнаў.*

ХРУПЛЯ́ЎНІК (Polycnemum), род кветкавых раслін сям. лебядовых. 6 відаў. Пашыраны ў Еўразіі і Паўн. Афрыцы. На Беларусі 2 віды: Х. вялікі (P.majus) і палявы (P.arvense). Трапляецца ўздоўж дарог, на аблогах, каля жылля.

Аднагадовыя травяністыя расліны і паўкусцікі. Сцёблы галінастыя з тонкімі прыўзнятымі галінкамі. Лісце чаргаванае, шылападобнае, сядзячае. Кветкі дробныя, адзіночныя. Плод — арэшак. *Дз.І.Трацякоў.*

Хрупляўнік палявы.

ХРУСТАЛЁЎ Барыс Міхайлавіч (н. 21.7.1947, г. Гомель), бел. вучоны ў галіне аэрадынамікі дысперсных патокаў, рэсурсазберажэння і экалогіі. Д-р тэхн. н. (1998), праф. (1991). Акад. бел. інж.-тэхнал. акадэміі (1994). Засл. работнік адукацыі Беларусі (1995). Скончыў БПІ (1970). З 1973 у Бел. нац. тэхн. ун-це (з 1983 заг. кафедры, у 1987—97 прарэктар, з 2000 рэктар). У 1997—2000 першы нам. міністра адукацыі Беларусі. Навук. працы па стварэнні экалагічна чыстых, малаадходных тэхнал. працэсаў пры транспарціроўцы сыпкіх рэчываў, павышэнні эфектыўнасці ўстановак па ачыстцы забруджаных выкідаў, распрацоўцы прынцыпаў вучэбна-навукова-выtворчай дзейнасці па павышэнні якасці падрыхтоўкі інж.-тэхн. спецыялістаў.

Тв.: Пневматический транспорт сыпучих материалов. Мн., 1983 (разам з Л.С.Клячко, Э.Х.Адэльскім); Теплоснабжение и вентиляция. Мн., 1997 (у сааўт.); Пневматический транспорт. Мн., 1998 (разам з М.У.Кісловым). *А.І.Болсун.*

ХРУСТАЛЁЎ .Уладзімір Якаўлевіч (16.6.1896, С.-Пецярбург — 19.5.1954), бел. жывапісец, педагог. Вучыўся ў студыі Б.Кустодзіева, Пецярбургскай АМ (1917—19). У 1919—22 выкладаў у Нар. маст. школе ў г. Веліж Смаленскай вобл., у 1926—41 у Віцебскім, у 1947—54 у Мінскім маст. вучылішчах. Пісаў жанравыя кампазіцыі, партрэты, пейзажы. Яго творы адметныя рэалізмам вобразаў, дакладнай перадачай дэталей: «Від Віцебска» (1927), «Будаўніцтва» (1929), «Вясна» (1936), «Канцэрт лесасплаўшчыкаў на Дзвіне» (1940), «Заслонаў дае заданне сваім партызанам», «Партрэт дачкі мастака» (абодва 1945), «У пошуках маці», «Нацюрморт» (абодва 1947), «Пераезд у новы дом» (1948), «Канстанцін Заслонаў» (1950), «Зіма» (1951) і інш. *Г.М.Ярмоленка.*

ХРУСТЫ́, х р у ш ч ы, бел. нар. страва. Вырабляюць з пшанічнай мукі, замешанай на малацэ, з дабаўленнем яек, масла, цукру. Цеста тонка раскачваюць, рэжуць на вузкія палоскі, надаюць ім адмысловую форму і пякуць у растопленым тлушчы ці алеі. Гатовыя Х. пасыпаюць цукрам.

ХРУСЦЯЛЁЎСКІ (Chróścielewski) Тадэвуш (н. 3.6.1920, г. Мінск-Мазавецкі, Польшча), польскі пісьменнік, перакладчык. Скончыў Варшаўскі ун-т (1946). Працаваў у ліцэі, у Лодзінскім выд-ве, у перыяд. друку. Друкуецца з 1937. Аўтар кніг паэзіі «Наймілейшыя мясціны» (1956), «Утосны месяц» (1960), «Выбраная паэзія» (1984), прозы «Сям'я Аднарожцаў» (1961), «Школа дзвюх дзяўчат» (1965), «Пурпуровая гадзіна» (1968), «Мая жаніцьба ў краіне феакаў» (1979), «Майстэрня чараўнікоў» (1986) пра польскую інтэлігенцыю і рабочых; у іх філас. роздум, антыфаш. матывы. Кн. літ. рэпартажаў і эсэ «Старасвецкае падарожжа» (1982) пра польска-бел., польска-рус., польска-ўкр. і польска-літоўскія літ. кантакты. Бел. матывамі прасякнуты яго вершы «Свіслач», «Званы і званочкі Хатыні», «Бераставіца»; бел. паэзіі прысвяціў арт. «Янка Купала і яго гуслі», «Пра Якуба Коласа», «Прызнанні перакладчыка» і інш. Аўтар рэпартажаў «Госці ў Мінску», «Яны са спаленых вёсак» (пра Хатынь), «Дзе з'явіўся на свет Янка Купала». Складальнік і аўтар прадмоў да зб-каў Я.Купалы «А хто там ідзе?» (1981, у ім яго пер. паэмы «Яна і я», асобных вершаў), Я.Коласа «Так спявае любімая дудка» (1982), Р.Барадуліна «Свята пчалы» (1986). Пераклаў вершы М.Багдановіча, Д.Бічэль-Загнетавай, Ц.Гартнага, П.Глебкі, А.Грачанікава, У.Дубоўкі, В.Іпатавай, У.Караткевіча, К.Кірэенкі, М.Лужаніна, П.Панчанкі, Я.Сіпакова, М.Танка, Я.Чачота і інш. На бел. мову яго асобныя творы пераклалі А.Лойка, П.Макаль, Н.Мацяш, Р.Семашкевіч, М.Танк і інш.

Тв.: Бел пер. — у кн.: Горад мільённы і мы: Паэзія чырвонай Лодзі. Мн., 1972; На слядах майго дома. Мн., 1977.

Літ.: F o r n a l c z y k F. Z rodu poetów. Łodź, 1969.

Б.М.Хрусталёў.



І.Ф.Хруцкі.

ХРУ́ЦКІ Іван Фаміч (8.2.1810, г.п. Ула Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл. — 13.1.1885), беларускі жывапісец. Твор-

І.Хруцкі. Партрэт невядомай. 1830-я г.

У.Хрусталёў. Канстанцін Заслонаў. 1950.

часць звязана з маст. жыццём Беларусі і Расіі. Скончыў ф-т вольных мастацтваў Полацкага калегіума (1827), Пецярбургскую АМ (1836). Акадэмік жывапісу (1839). У 1840-я г. жыў пад Вільняй, з 1845 — у маёнтку Захарнічы (цяпер вёска ў Полацкім р-не Віцебскай вобл.). Працаваў у жанрах нацюрморта, партрэта, пейзажа, інтэр'ера ў традыцыях акад. школы. Яго нацюрморты эфектныя, дэкар., адметныя ўраўнаважанасцю кампазіцыі, выключным майстэрствам у перадачы формы, колеру, аб'ёму, фактуры прадметаў: «Кветкі і плады» (1836), «Грыбы і агуркі» (1839), «Нацюрморт са свечкай», «Кветкі і садавіна» (абодва 1839,

1840), «Садавіна і птушка» (1830-я г.), «Нацюрморт» (1839, 1869), «Нацюрморт з грыбамі» (1842), «Бітая дзічына, агародніна і грыбы» (1854). Партрэтная творчасць развівалася ад дэкаратыўнасці да выяўлення індывід. асаблівасцей асобы: «Партрэт невядомай» (1830-я г., 1843), «Хлопчык з кошыкам і грыбамі» (1834), «Партрэт маладой жанчыны з кошыкам» (1835), «Партрэт невядомай з кветкамі і садавінай», партрэты І.Булгака, мітрапаліта І.Сямашкі (усе 1838), «Партрэт хлопчыка ў саламяным брылі» (канец 1830 — пач. 1840-х г.), партрэты кнігавыдаўца І.Глазунова (1843), К.Бубноўскага і А.Бубноўскай (абодва 1845), «Сямейны партрэт» (1850), І.І.Хруцкага, сына мастака ў дзяцінстве (1855), «Аўтапартрэт» (1884). Пісаў таксама інтэр'еры («У пакоях мастака. Захарнічы», 1855), пейзажы («Від на Ялагіным востраве ў Пецярбургу», 1839; «Від у маёнтку», 1847). Размалёўваў іканастасы ў цэрквах і саборах Вільні і Коўна (1845—55).

Літ.: И.Ф.Хрущкий: К 175-летию со дня рождения: [Кат. выставки]. Мн., 1985; И.Ф.Хрущкий, 1810—1885: [Альбом-каталог]. Мн., 1990. *А.К.Рэсіна.*

І.Хрушкі. Нацюрморт. 1839.

ХРУ́ЦКІ Канстанцін Вікенцьевіч (18.1.1855, в. Корачын Іванэвіцкага р-на Брэсцкай вобл. — 14.2.1969), герой рус.-турэцкай вайны 1877—78. Скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю (1885). У 1875—81 у арміі, ст. унтэр-афіцэр, удзельнік вызвалення г. Варна, штурму крэпасці Плеўна. Вызначыўся пры абароне перавалу на Шыпцы. З 1885 сельскі настаўнік у Гродзенскай губ. З 1915 у Маскве, удзельнік Кастр. рэвалюцыі. У 1919 за рэв. дзейнасць арыштаваны ў Омску калчакаўцамі і прыгавораны да расстрэлу. Пасля вызвалення Чырв. Арміяй працаваў у Сібіры, з 1923 у Новарасійску. Узнагароджаны 2 Георгіеўскімі крыжамі, ордэнамі Георгія Дзімітрова і «Знакам Пашаны».

«ХРУШЧ» («Maikäqer»), кодавая назва карнай аперацыі ням. фашыстаў супраць партызан і насельніцтва *Клічаўскай партызанскай зоны* Магілёўскай вобл. ў 1942 і 1943 у Вял. Айч. вайну. Першая аперацыя праводзілася ў ліп. 1942 сіламі 203-й ахоўнай дывізіі, спец. карнага батальёна «Ост», батальёнаў «Бярэзіна» і «Дняпро». Партызаны ўпартым супраціўленнем і контратакамі сарвалі планы карнікаў акружыць і знішчыць партыз. сілы, нанеслі ім вял. страты. 21 ліп. на дапамогу карнікам перакінуты ваен. сілы і працяг аперацыі атрымаў назву «Арол». Другая аперацыя праводзілася ў маі 1943 сіламі грэнадзёрскіх 2-га самакатнага і 635-га вучэбнапалявога, 13-га паліцэйскага палкоў, 3 эскадронаў з авіяц., танк. і артыл. падраздзяленнямі. Карнікі заблакіравалі партызан ва Усакінскім лесе і абрушылі на іх шквал артыл. і мінамётнага агню. Сустрэчнымі баямі па ўсёй лініі акружэння партызаны прымусілі ворага акапацца, стварылі шмат перашкод для хуткага манеўру карнікаў і невял. групамі пачалі выходзіць з блакады. Ням. камандаванне спыніла аперацыю, і партызаны вярнуліся на месцы свайго базіравання. *У.С.Пасэ.*

ХРУШЧАКІ́ МУЧНЫ́Я, жукі сям. чарнацелак. 2 роды, 4 віды. Пашыраны ўсюды, у т.л. на Беларусі. Жывуць у жылых памяшканнях, на складах, элеватарах. Псуюць зерне і мучныя прадукты (адсюль назва). Найб. вядомыя Х.м. вялікі (Tenebrio molitor) і Х.м. малы (Tribolium confusum).

Даўж. 3—19 мм. Цела прадаўгаватае, голае, чорнае, матавае, слабаблiскучае. Вусікі і ногі бураватыя. Надкрылы паралельныя. Лічынкі Х.м. вялікага (т.зв. мучныя чэрві) — корм для птушак, яшчарак і інш. *С.Л.Максімава.*

1 2

Хрушчакі мучныя: 1 — вялікі; 2 — малы.

ХРУШЧО́Ў Мікіта Сяргеевіч (17.4.1894, с. Калінаўка Курскай вобл., Расія — 11.9.1971), савецкі дзярж. і паліт. дзеяч.

М.С.Хрушчоў.

Герой Сав. Саюза (1964), тройчы Герой Сац. Працы (1954, 1957, 1961). Ген.-лейт. (1943). Вучыўся ў Прамысл. акадэміі (Масква, 1929—30). З 1909 слесар на з-дах і шахтах Данбаса. Чл. Камуніст. партыі (з 1918), яе ЦК (1934—66), Палітбюро (Прэзідыума) ЦК (1939—64). Удзельнік грамадз. вайны. З пач. 1920-х г. на кіруючай парт. рабоце на Украіне (у 1924 удзельнік трацкісцкай апазіцыі), з 1931 — у Маскве; з 1935 1-ы сакратар Маскоўскіх гар. і абл. к-таў партыі. У 1938—сак. 1947 і снеж. 1947—49 1-ы сакратар ЦК кампартыі Украіны, адначасова ў 1944—47 старшыня СНК (з 1946 СМ) Украіны. Меў дачыненне да *рэпрэсій палітычных* у Маскве і на Украіне. У Вял. Айч. вайну чл. ваен. саветаў шэрагу франтоў. З 1949 сакратар ЦК і 1-ы сакратар Маскоўскага к-та ВКП(б), з вер. 1953 1-ы сакратар ЦК КПСС, адначасова ў 1958—64 старшыня СМ СССР. Адзін з ініцыятараў рэабілітацыі ахвяр паліт. рэпрэсій 1930 — пач. 50-х г.; на XX (1956) і XXII (1961) з'ездах КПСС выступіў з рэзкай крытыкай *культу асобы* і дзейнасці І.В.*Сталіна*. Імкнуўся мадэрнізаваць парт.-дзярж. сістэму, абмежаваць прывілеі парт. і дзярж. апарату, палепшыць матэрыяльнае становішча насельніцтва, зрабіць сав. грамадства больш адкрытым. У перыяд яго знаходжання на вышэйшых дзярж. і парт. пасадах вялося масавае асваенне цалінных і абложных зямель (1954—60), буд-ва добраўпарадкаванага жылля для працоўных, пачалося асваенне космасу (1957). У знешняй палітыцы праводзіўся курс на пашырэнне адносін з капіталіст. і новымі незалежнымі краінамі, змякчэнне наступстваў гонкі ядз. узбраенняў (Маскоўскі *Дагавор аб забароне і абмежаванні выпрабаванняў атамнай зброі 1963*), рабіліся захады па *раззбраенні* (скарачэнне ўзбр. сіл СССР у 1955 — пач. 60-х г. больш як на 3 млн. чал., прапанаваны ў 1962 сав. праект дагавора аб усеаг. і поўным раззбраенні), значна пашырыліся між-

нар. культурныя сувязі. Аднак некаторыя рашэнні Х. часам прыводзілі да рэзкага абвастрэння міжнар. адносін (крызіс 1961 вакол *Заходняга Берліна, Карыбскі крызіс 1962)*. Часовае аслабленне ідэалаг. і адм. націску на творчую інтэлігенцыю пасля 1953 («адліга») спрыяла значным дасягненням у галіне культуры, аднак з пач. 1960-х г. яго культ. палітыка стала больш жорсткай. Адначасова ў выніку шэрагу непрадуманых рашэнняў Х. ў галіне кіраўніцтва сельскай гаспадаркай пагоршылася забеспячэнне гар. насельніцтва прадуктамі харчавання. Неабгрунтаванымі былі яго заклікі «дагнаць і перагнаць Амерыку» і абяцанні пабудаваць *камунізм* да 1980. Вынікам незадаволенасці парт. і дзярж. апарату палітыкай і валюнтарысцкім стылем кіраўніцтва Х. стала яго вызваленне («па стане здароўя») ад усіх пасад на кастр. пленуме ЦК КПСС 1964. Аўтар мемуараў.

Тв.: Воспоминания: Избр. фрагменты. М., 1997; Время. Люди. Власть: [Воспоминания. Кн. 1—4]. М., 1999.

Літ.: Мядзведзеў Р.А. М.С.Хрушчоў: Паліт. партрэт: Пер. з рус. Мн., 1989; Н.С.Хрущев: Материалы науч. конф. М., 1994. *М.Г.Нікіцін.*

ХРУШЧЫ́, экалагічная група раслінаедных жукоў сям. пласцініставусых. Аб'ядноўвае шэраг падсям. (Melolonthinae, Pachydeminae, Rhizotroginae і інш.). Каля 7 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды, акрамя халодных абласцей, шматлікія ў тропіках. Жывуць у глебе. На Беларусі 3 віды: *майскі хрушч* (2 віды), Х. мармуровы (Polyphylla fullo).

1 2

Хрушчы: 1 — мармуровы; 2 — чэрвеньскі, або нехрушч.

1 2 3

Хрушчыкі: 1 — кузька-крыжаносец; 2 — садовы; 3 — лугавы.

Даўж. 4—60 мм. Цела чорнае, бурае, жоўтае, бывае з метал. бляскам; укрыта белымі, жоўтымі ці бурымі валаскамі або лускавінкамі. Вусікі 7—10-члянікавыя з пласціністай булавой. Лічынкі белыя, С-падобна выгнутыя, мясістыя, з жоўтай або чорна-бурай галавой і доўгімі нагамі. Жукі пашкоджваюць лісце дрэў, некат. не кормяцца. Іл. гл. таксама да арт. *Майскі хрушч*. *С.Л.Максімава.*

ХРУ́ШЧЫКІ (Rutelinae), падсямейства жукоў сям. пласцініставусых. Больш за 2,7 тыс. відаў. Пашыраны паўсюдна, акрамя Антарктыды. У Еўропе найб. трапляецца кузька збожжавы (Anisoplia austriaca) — шкоднік збожжавых культур. На Беларусі 4 віды Х.: лугавы, або кузька зялёны (Anomala dubia), садовы (Phyllopertha horticola), хрушч палявы, або прыгажун (Anisoplia segetum) і кузька-крыжаносец (Anisoplia agricola).

Даўж. да 15 мм. Цела бурае, зялёнае, сіняе, чорнае, з метал. бляскам. Вусікі 9-члянікавыя, з кароткай булавой. Галёнкі задніх ног са шпорамі. Кіпцюркі лапак неаднолькавай велічыні. Лічынкі С-падобныя, мяккія, складкаватыя, белавата-крэмавыя, укрыты рэдкімі валаскамі, на брушку рады шыпікаў. Дарослыя пашкоджваюць лісце і кветкі, няспелае збожжа; некат. не кормяцца. Лічынкі развіваюцца ў глебе, шкодзяць падземным ч. раслін. Цыкл развіцця 1—2 гады. *А.М.Петрыкаў.*

ХРШЧАНО́ВІЧ Казімір Вікенцій (1794, маёнтак Бястроск каля б. в. Шунеўка Докшыцкага р-на Віцебскай вобл. — 8.5.1871), бел. архітэктар. Скончыў Віленскі ун-т (1819). У 1825—63 мінскі губ. архітэктар. Найб. значныя работы ў Мінску: губернатарскі дом, будынкі вайск. шпіталя па вул. Фрунзе (1830-я г.), мужчынскай гімназіі па вул. Леніна (1844), гар. бальніцы (1840-я г.), адміністрацыйны на рагу пл. Свабоды і вул. Інтэрнацыянальнай (1852, з арх. Л.Садоўскім). Аўтар праектаў: у Мінску — ратушы (1825), жылога дома Аксельрода (1844), адм. устаноў (1847, 1852, 1853, 1857) і інш., у Барысаве — адм. устаноў (1843), у Пінску — жылога дома А.Ліпко (1847) і інш. *В.М.Чарнатаў.*

ХРЫЗАБЕРЫ́Л (ад грэч. chrysos золата + *берыл*), мінерал падкласа складаных аксідаў, аксід *берылію* і *алюмінію* $Al_2(BeO_4)$. Змяшчае да 19,8% BeO, да 80,2% Al_2O_3, прымесі аксідаў жалеза, тытану, хрому. Крышталізуецца ў рамбічнай сінганіі. Утварае таблітчастыя, кароткапрызматычныя крышталі, зорчатыя трайнікі прарастання. Колер жоўты, зеленавата-жоўты, аліўкава-зялёны, зрэдку бясколерны. Валодае моцным дыхраізмам: зялёны пры сонечным і чырвоны пры штучным святле (гл. *Александрыт*), цымафан (т.зв. «кашэчае вока») апалесцыруе. Цв. 8,5. Шчыльн. 3,5—3,8 г/см^3. Палігенны, трапляецца ў гранітах, гранітных пегматытах, слюдзяных сланцах, у россыпах і інш. Александрыт і цымафан — каштоўныя камяні 2-га парадку. Радовішчы ў Расіі, Бразіліі, ЗША, Канадзе, Шры-Ланцы, М'янме, Індыі і інш. Атрымліваюць і штучна.

ХРЫЗАЛІ́Т (ад грэч. chrysos золата + lithos камень), п е р ы д о т, мінерал, жаўтавата-зялёная і зялёная празрыстая разнавіднасць *алівіну*. Афарбоўка залежыць ад колькасці Fe^{2+} (звычайна 5—8% FeO), а жоўтыя адценні — ад прымесі Fe^{3+}. Трапляецца ў выглядзе ўкрапанікаў і нодулей (грубазярністых агрэгатаў) у кімберлітах, шчолачных алівінавых базальтах, у зонах метасаматозу гіпербазітавых і ультраасноўных шчолачных масіваў. Выкарыстоўваецца як ювелірны камень 4-га парадку. Радовішчы ў Расіі, ЗША, Егіпце і інш.

У.А.**Хрыпач**.

ХРЫЗАНТЭ́МА (Chrysanthemum), род кветкавых раслін сям. складанакветных (астравых). Каля 5 відаў. Пашыраны пераважна ў краінах Міжземнамор'я. На Беларусі як дэкар. расліны культывуюцца Х.: кіляватая (Ch. carinatum), пасяўная (Ch. segetum) і ўвенчаная (Ch. coronarium).

Аднагадовыя травяністыя расліны выш. да 1 м. Сцёблы галінастыя. Лісце чаргаванае, перыста-раздзельнае, суцэльнакрайняе або зубчастае. Суквецце — кошык, краявыя кветкі ў ім язычковыя, двух- ці трохколерныя, унутр. — трубчастыя, адна-двухколерныя. Плод — сямянка. Шматгадовыя віды (каля 200) з буйнымі махровымі суквеццямі таксама наз. Х., іх адносяць да роду Dendranthema, які пашыраны ва ўмераным поясе Еўразіі. У Кітаі і Японіі вырошчваюць як дэкар., лек. і гароднінную культуру з 6—5 ст. да н.э., у Еўропе — з 17 ст. Маюць больш за 5 тыс. сартоў і форм.

ХРЫПА́Ч Уладзімір Аляксандравіч (н. 2.10.1949, Мінск), бел. вучоны ў галіне біяарганічнай хіміі. Чл.-кар. Нац. АН

Хрызаберыл.

Беларусі (2000), д-р хім. н. (1990), праф. (1997). Скончыў БДУ (1971). З 1971 у Ін-це фізіка-арган. хіміі, з 1974 у Ін-це біярган. хіміі Нац. АН Беларусі (з 1982 заг. лабараторыі). Навук. працы па хіміі стэроідных гармонаў і роднасных ім біярэгулятараў, рашэнні праблем іх поўнага і частковага хім. сінтэзу, структурна-функцыян. узаемасувязей і практычнага выкарыстання. Выявіў новы клас нізкамалекулярных імунамадулятараў у шэрагу гетэрацыклічных аналагаў стэроідных гармонаў. Распрацаваў метады сінтэзу і вывучыў фізіёлага-біяхім. аспекты новага класа фітагармонаў — брасінастэроідаў. Дзярж. прэмія Беларусі 1996.

Тв.: Брассиностероиды. Мн., 1993 (разам з Ф.А.Лахвічам, У.М.Жабінскім); Brassinosteroids: A new class of plant hormones. San Diego etc., 1999 (разам з У.М.Жабінскім, А. дэ Грут); Twenty years of brassinosteroids: Steroidal plant hormones warrant better crops for the XXI century (з імі ж) // Annals of Botany. 2000. Vol. 86.

ХРЫСТАЎ Барыс (18.5.1914, г. Плоўдзіў, Балгарыя — 1993), балгарскі спявак (бас). Нар. арт. Балгарыі (1975). Скончыў Сафійскі ун-т. Спевам вучыўся ў Італіі. З 1942 жыў у Рыме. Выступаў у многіх т-рах свету, з 1946 саліст т-ра «Ла-Скала». Прадаўжальнік традыцый Ф.*Шаляпіна*. Сярод лепшых партый: Барыс Гадуноў («Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага), Філіп II («Дон Карлас» Дж.Вердзі), Мефістофель («Фауст» Ш.Гуно) і інш.

Літ.: Божков А. Б.Христов. София, 1985.

ХРЫСТАЎ Добры (14.12.1875, г. Варна, Балгарыя — 23.1.1941), балгарскі кампазітар, фальклярыст, харавы дырыжор, педагог; адзін з заснавальнікаў балг. кампазітарскай школы. Чл. Балг. АН (1929). Вучыўся ў Пражскай кансерваторыі (1900—03, кл. А.*Дворжака*). З 1894 кіраўнік арганізаванага ім хар. т-ва «Гусла», выкладаў у Варне. З 1907 у Сафіі, выкладчык і дырэктар муз. вучылішча, у 1922—33 праф. Дзярж. муз. акадэміі. З 1935 узначальваў хор храма Аляксандра Неўскага. Сярод твораў: сімф. п'есы «Балканскія сюіты» (1903, 1916), уверцюра «Івайла» (1906), апрацоўкі балг. нар. мелодый, хары, песні і інш. Даследаваў фальклор балг. і інш. народаў Балк. п-ва. Аўтар навук. прац, падручнікаў і інш.

Тв.: Рус. пер. — Теоретические основы болгарской народной музыки. М., 1959.

«ХРЫСТАФО́Р», Мінскі тэатр сатыры і гумару «Хрыстафор». Створаны ў 1987 пісьменнікам-сатырыкам У.Пярцовым і артыстамі Бел. т-ра імя Я.Купалы Я.Крыжаноўскім, Ю.Лясным. Гал. рэжысёры: Пярцоў, Крыжаноўскі (з 1994); дырэктар Лясны. У рэпертуары эстрадна-сатыр. праграмы «Хто каго?!», «М» і «Ж», «Ад Чыжоўкі да Камароўкі», «Усе на ўкол!» (аўтар усіх Пярцоў), «Кавалеры запрашаюць дамаў!» А.Длускага і Пярцова, «Дзень танкіста» С.Лабазёрава, «Пастой, паравоз!» С.Камісарава, «Гаворыць і паказвае», «Ад раддома... да скону» і інш., пабудаваныя на прыёмах розыгрышу з выкарыстаннем сатыр. маналогаў і сцэнак, муз. эксцэнтрыкі і пародыі, лірычнай бардаўскай песні, пантамімічных мініяцюр і непасрэднага ўдзелу гледачоў. У трупе т-ра (2002): У.Варанкоў, А.Вергуноў, Длускі, Камісараў, Крыжаноўскі. Калектыў — лаўрэат 2-га Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады (1988), міжнар. конкурсу «Мора смеху — 92» (Рыга; Гран-пры).

А.В.Спрынчан.

Да арт. «Хрыстафор». Сцэна са спектакля «Гаворыць і паказвае».

ХРЫСТАФО́Р ФІЛАЛЕ́Т (у пер. з грэч. Хрыстаносец Праўдалюб; ? — каля 1624), бел. і ўкр. пісьменнік-палеміст, царк.-рэліг. дзеяч. Аўтар палемічнага твора «*Апакрысіс*» (на польскай мове 1597, на старабел. 1598), скіраванага супраць Брэсцкай уніі 1596 і кнігі П.Скаргі «Апісанне і абарона сабору рускага Берасцейскага» (1597). Шырока выкарыстоўваў тэкст Бібліі, пісанні грэч. і лац. айцоў царквы, звяртаўся да тагачасных дзярж. дакументаў і прыватных лістоў вядомых асоб. У творы адстойваў права на самастойнасць праваслаўя ў Рэчы Паспалітай, даказваў згубнасць шляху гвалтоўнага насаджэння уніі. «Апакрысіс» насычаны вобразамі-алегорыямі, прыказкамі, прымаўкамі, эпітэтамі, пераказамі сюжэтаў з Эзопа і Федра. Перавыдадзены ў 1882 у серыі «Руская гістарычная бібліятэка». Мяркуюць, што пад псеўданімам Х.Ф. выступаў валынскі пратэстант Марцін Бранеўскі.

Літ.: Яременко П.К. Український письменник-полеміст Христофор Філалет і його «Апокрисис». Львів, 1964; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Т. 1. Мн., 1968.

У.Г.Кароткі.

ХРЫСТО́С, Ісус Хрыстос (грэч. Christós, стараж.-яўр. Ешуа, «машыях» літар. — месія, памазаннік; каля 4 г. да н.э. — каля 30 г. н.э.), заснавальнік

1

2

3

Хрызантэма: 1 — увенчаная; 2 — пасяўная; 3 — кіляватая.

хрысціянства; паводле хрысц. веравучэння, Богачалавек, у якім спалучаны боская (Бог-сын, 2-я асоба *Святой Тройцы*) і чалавечая (нараджэнне ад Дзевы Марыі) прыроды. Добраахвотна прыняў пакуты і смерць на крыжы дзеля збавення ад першароднага граху, здзейсненага Адамам і Евай у акце грэхападзення. Прапаведаваў сваё вучэнне разам з вучнямі (гл. *Апосталы*), тварыў цуды (уваскрэсенне мёртвых, хаджэнне па вадзе, вылячэнне хворых і інш.). Напярэдадні Вялікадня Х. урачыста ўехаў на асле ў Іерусалім, і натоўп вітаў яго як месіянскага цара. Іудзейскія старэйшыны вырашылі выдаць яго рымскім уладам для пакарання смерцю. Калі Х. сярод апосталаў спраўляў абрад велікоднай вячэры (гл. *Тайная вячэра*), ён быў схоплены памочнікамі старэйшын па знаку *Іуды Іскарыёта* («пацалунак Іуды») і адведзены на суд Сінедрыёна, які па ілжывым абвінавачанні ў богазневажанні вынес яму смяротны прыгавор, пазней пацвярджаны рым. пракуратарам *Понціем Пілатам*. Пасля распяцця на крыжы і наступнага ўваскрэсення Х. на працягу 40 дзён размаўляў з вучнямі, а потым узнёсся на неба. Вера ў Х. адрознівае хрысціянства ад *іудаізму*, ва ўлонні якога яно ўзнікла. Жыццё і вучэнне Х. выкладзены ў Новым запавеце Свяшчэннага пісання (*Біблія*). Многія з дэталей біяграфіі Х. лічацца прадказанымі ў Старым запавеце, дзякуючы чаму ствараецца пераемная сувязь паміж Старым і Новым запаветамі. Некат. даследчыкі, асабліва ў 19 ст., адмаўлялі само існаванне Х. Большасць сучасных вучоных прызнаюць гістарычнасць Х.

Хрыстос Уседзяржыцель. 1640. Беларуская іканапісная школа.

Хрыстос Уседзяржыцель. 16 ст. Беларуская іканапісная школа.

ХРЫСЦІ́ЛЬНЯ, тое, што *баптыстэрый*.

ХРЫСЦІЯНІ́ЙСКАЯ КАНВЕ́НЦЫЯ 1907, міжнародны дагавор аб тэрытарыяльнай недатыкальнасці Нарвегіі, якая ў 1905 абвясціла сваю дзярж. незалежнасць. Заключаны 2.11.1907 у г. Хрысціянія (зараз *Осла*) Расіяй, Германіяй, Вялікабрытаніяй, Францыяй і Нарвегіяй тэрмінам на 10 гадоў. Паводле Х.к. вял. дзяржавы абавязваліся прызнаваць і захоўваць недатыкальнасць Нарвегіі, а Нарвегія — не ўступаць ніякай дзяржаве (ні пастаянна, ні часова) ніякай часткі сваёй тэрыторыі. Дзейнічала да 1928.

ХРЫСЦІЯ́НІЯ (Christiania), назва сталіцы Нарвегіі г. *Осла* ў 1624—1924.

ХРЫСЦІЯНО́ВІЧ Сяргей Аляксеевіч (9.11.1908, С.-Пецярбург — 28.4.2000), расійскі вучоны ў галіне механікі. Акад. АН СССР (1943, чл.-кар. 1939). Герой Сац. Працы (1969). Скончыў Ленінградскі ун-т (1930). З 1930 у Дзярж. гідралагічным ін-це, у 1937—53 у Цэнтр. аэрагідрадынамічным ін-це. З 1957 у Ін-це тэарэт. і прыкладной механікі Сібірскага аддз. АН СССР (дырэктар). З 1965 ва Усесаюзным НДІ фізіка-тэхн. і радыётэхн. вымярэнняў. З 1972 у Ін-це праблем механікі АН СССР. Навук. працы па механіцы вадкасцей і газаў, механіцы дэфармаванага цвёрдага цела. Распрацаваў тэорыю абцякання газам профілю пры наяўнасці падымальнай сілы на вялікіх дагукавых скарасцях. Прапанаваў тэорыю пластычнага дэфармавання ўмацавальных матэрыялаў. Кіраваў стварэннем трансгукавых аэрадынамічных труб. Дзярж. прэміі СССР 1942, 1946, 1952.

С.А.Хрысціяновіч.

ХРЫСЦІЯ́НСКА-ДЭМАКРАТЫ́ЧНАЯ ПА́РТЫЯ Італіі (ХДП, Partito della Democrazia Cristiana), адна з вядучых партый італьян. паліт. сістэмы ў 1943—94. Засн. ў 1943 на базе каталіцкай партыі «Папаляры». У аснове яе ідэалогіі сац. дактрына каталіцызму. Сац. склад разнастайны, але пераважалі сярэднія пласты. У 1946—81 і 1984—93 узначальвала кааліцыйныя ўрады. З 1960-х г. праводзіла тактыку «левага цэнтра», утвараючы блокі з сацыялістамі, сацыял-дэмакратамі і рэспубліканцамі. У 1994 на базе ХДП утворана Італьян. нар. партыя, з правага крыла якой у 1995 вылучылася партыя Аб'яднаныя хрысц. дэмакраты.

ХРЫСЦІЯ́НСКА-ДЭМАКРАТЫ́ЧНЫ САЮ́З (ХДС; ням. Christlich-Demokratische Union, CDU), адна з вядучых партый паліт. сістэмы Германіі (685 тыс. чл. у 1995). Засн. ў чэрв. 1945 як рэгіянальная ў Берліне і Рэйнскай вобласці; з 1950 агульнагерм. партыя. У аснове яе ідэалогіі прынцыпы хрысц. сацыялізму, дэмакратызму, федэралізму, сац. рыначнай эканомікі; у знешняй палітыцы выступае за інтэграцыю Еўропы. У *бундэстагу* стварае агульную фракцыю з *Хрысціянска-сацыяльным саюзам*. Узначальваецца федэральным старшынёй (з 1998 В.Шойбель) і (з 1967) ген. сакратаром, вышэйшы орган — федэральны парт. з'езд. У 1949—69 і 1982—98 кіруючая партыя. Да 1990 аднайм. партыя дзейнічала ў ГДР (пад кантролем кіруючай Сацыяліст. адзінай партыі Германіі). *У.Я.Калаткоў.*

ХРЫСЦІЯ́НСКА-САЦЫЯ́ЛЬНЫ САЮ́З (ХСС; ням. Christlich Soziale Union, CSU) у Баварыі, адна з вядучых рэгіянальных партый у паліт. сістэме Германіі. Засн. ў ліст. 1945 у г. Мюнхен. Выступае за ўладкаванне герм. грамадства на прынцыпах хрысц. сацыялізму, за наданне большай самастойнасці федэральным землям, у тл. і ў справе Еўрап. інтэграцыі («Еўропа рэгіёнаў»). Сац. база — вернікі каталікі і пратэстанты. Дзейнічае на тэр. *Баварыі*, дзе неаднаразова быў кіруючай парты-

яй; на федэральным узроўні прадстаўлены дэпутатамі, якія з 1949 утвараюць агульную фракцыю з *Хрысціянска-дэмакратычным саюзам* у *бундэстагу*. Узначальваецца старшынёй і ген. сакратаром. *У.Я.Калаткоў.*

«ХРЫСЦІЯ́НСКАЯ ДУ́МКА», каталіцкі грамадска-асветны часопіс. Выдаваўся са студз. 1928 да жн. 1939 у Вільні на бел. мове лацінкай (асобныя нумары ў 1938 кірыліцай). З 1928 выходзіў 2, у 1938—39 — 3 разы на месяц. Меў рубрыкі: «З рэлігійнага жыцця», «Хроніка», «З беларускай нівы», «Лісты з вёскі», «З усяго свету» і інш. Ставіў за мэту абудзіць у беларусаў-католікаў рэліг. і нац. свядомасць, «зрабіць зразумелым і даступным сутнасць хрысціянскага ідэалу для нашага народу». Адстойваў хрысціянска-дэмакр. каштоўнасці, выступаў за нац.-культ. адраджэнне Беларусі, супраць паланізацыі, у абарону зах.-бел. насельніцтва. Асвятляў дзейнасць Бел. хрысц. дэмакратыі, Бел. нац. к-та, Бел. студэнцкага саюза, Віленскай бел. гімназіі, грамадска-паліт., сац.-эканам. і культ. жыццё ў СССР, падзеі міжнар. жыцця. Апублікаваў гіст.-культуралагічныя даследаванні А.Станкевіча, філас.-тэм. творы Т. Кемпійскага, працы Я.Тарасевіча, В.Шутовіча, філас. дзённік К.Сваяка, байкі В.Адважнага, вершы А.Бярозкі, Я.Быліны, Я.Драздовіча, М.Машары, С.Новіка-Пеюна, У.Паўлюкоўскага, Я.Пачопкі і інш., анатацыі, рэцэнзіі, літ. пераклады. Друкаваў матэрыялы багаслоўскага характару, да юбілейных дат айч. і сусв. гісторыі, творы для дзяцей. Асобнымі кнігамі і брашурамі выдаў шэраг уласных матэрыялаў («Каляндарык «Хрысціянскай думкі» для беларускай моладзі на 1928», працы Станкевіча). Праследаваўся ўладамі, асобныя нумары былі канфіскаваны. *А.М.Вабішчэвіч.*

«ХРЫСЦІЯ́НСКАЯ ДУ́МКА», рэлігійна-літаратурны часопіс. Выдаваўся ў 1992—94 у Мінску на бел. мове *Беларускай каталіцкай грамадой*. Друкаваў тэалагічныя працы Ч.Сіповіча, А.Станкевіча, Я.Тарасевіча, Л.Гарошкі і інш., літ. творы рэліг. тэматыкі Я.Золака, Я.Юхнаўца, Л.Случаніна, К.Каганца, К.Сваяка і інш. Значную ўвагу аддаваў гісторыі хрысціянства на Беларусі (артыкулы А.Сідарэвіча, В.Чаропкі, А.Грыцкевіча, А.Жлуткі, В.Касмылёва, Я.Германовіча, Я.Янушкевіча, А.Мальдзіса, А.Бембеля і інш.). Паведамляў пра мінулы і сучасны стан асобных парафій (Браслаўскай, Магілёўскай, Мінскай, касцёла св. Тройцы і інш.). Выйшла 5 нумароў. *В.К.Чаропка.*

ХРЫСЦІЯ́НСКАЯ ДЭМАКРАТЫ́ЧНАЯ ЗЛУ́ЧНАСЦЬ, назва *Беларускай хрысціянскай дэмакратыі* ў 1917 — сярэдзіне 1920-х г.

ХРЫСЦІЯ́НСКІ САЦЫЯЛІ́ЗМ, кірунак у грамадскай думцы, прадстаўнікі якога імкнуцца надаць хрысц. рэлігіі сацыяліст. афарбоўку. Узнік у 1-й пал. 19 ст. як разнавіднасць феад. сацыялізму, у якім выявіліся негатыўныя адносіны адыходзячай феад. арыстакратыі да ўзнікаючага капіталізму. Найб. пашырэнне атрымаў у Францыі (Ф.Бюшэ, Ф.Ламенэ), Вялікабрытаніі (Ч.Кінгслі, Ф.Д.Морыс, тарыйская група «Маладая Англія») і ў Германіі (Ф.Баадэр, І.Хубер, В.Э.Кетэлер). Для вырашэння набалелых сац. праблем прыхільнікі Х.с. прапаноўвалі стварацъ з дапамогай дзяржавы вытв. асацыяцыі, ажыццяўляць на практыцы партнёрства класаў, праграму духоўна-рэліг. ўдасканалення людзей, заклікалі да ўсёдаравання і прымірэння. Шэраг прынцыпаў Х.с. ўключаны ў сац. дактрыну сучаснага *каталіцызму*, паліт.партыйный, прафес. саюзаў і грамадскіх аб'яднанняў, ідэалам якіх з'яўляецца хрысц. дэмакратыя. *І.В.Катлярoў.*

ХРЫСЦІЯ́НСКІЯ ПРАФСАЮ́ЗЫ, *прафесійныя саюзы*, у аснову дзейнасці якіх пакладзена сац. дактрына *каталіцызму* (хрысц. братэрства, мірнае супрацоўніцтва наёмных работнікаў і прадпрымальнікаў). Створаны ў канцы 19 ст. пры актыўным удзеле каталіцкай царквы (асновы дзейнасці сфармуляваны Рым. папам *Львом XIII* у энцыкліцы Rerum novarum) у краінах Зах. Еўропы, пазней з'явіліся ў большасці інш. краін свету. У 1920 пад апекай Ватыкана створана Міжнар. канфедэрацыя хрысц. прафсаюзаў (з 1968 *Сусветная канфедэрацыя працы*).

ХРЫСЦІЯ́НСТВА, адна з трох сусветных (побач з *будызмам* і *ісламам*) рэлігій. Узнікла ў 1 ст. як монатэістычнае вучэнне на базе традыцый *іудаізму* і ант. філасофіі ва ўсх. правінцыях Рым. імперыі на тэр. б. Ізраільска-Іудзейскага царства. Да 5 ст. распаўсюдзілася на ўсёй тэр. грэка-рым. цывілізацыі і залежных ад Рыма краінах Еўропы, Азіі, Паўн. Афрыкі. Пасля хрысціянізацыі большасці насельніцтва германа-раманскага (8 ст.) і слав. (10 ст.) рэгіёнаў стала гал. веравызнаннем у Еўропе. У 1-ым тыс. вылучыліся цэрквы монафізіцкага і арыянскага тыпу ў Афрыцы і на Б. Усходзе. У 2-й пал. 11 ст. Х. падзялілася на 2 галіны — *праваслаўе* і *каталіцызм*, ад якога ў 16 ст. аддзяліўся *пратэстантызм* у выглядзе трох асн. плыняў — *лютэранства, кальвінізму*, англіканства (гл. *Англіканская царква*). Асн. светапогляднай канцэпцыя Х. — богаўвасабленне (учалавечанне боскага сына Ісуса Хрыста, яго выратавальная місія ў зямной гісторыі), з якой вынікае надпрыроднае (трансцэндэнтнае) адзінства хрысціяніна з Богам і абс. каштоўнасць чалавечай асобы, прызначанай для ўваскрэсення пасля смерці, вечнага жыцця на духоўна пераўтвораных новым небе і новай зямлі ў царстве Ісуса Хрыста. Асн. догматы Х. — траістасць Бога (адзіная боская сутнасць у 3 іпастасях-асобах: Бога-бацькі — абс. першапачатку быцця; Бога-сына — логаса, або абс. сэнсу быцця; Святога Духа — жыватворнага боскага розуму); богаўвасабленне; смерць, уваскрэсенне і ўзнясенне на неба Ісуса *Хрыста* і яго будучае царства на пераўтворанай у выніку апакаліптычнай катастрофы новай зямлі. Асн. крыніцы вучэння, дагматыкі і царк. арганізацыі Х. — *Біблія*, раннехрысц. літ. традыцыя (*патрыстыка*) і вуснае паданне. У выніку пашырэння Х. на тэр. Зах. Еўропы, Еўразіі, а пасля каланізацыі Амерыкі, Аўстраліі, Афрыкі на інш. кантынентах сфарміравалася хрысц. цывілізацыя адкрытага тыпу, здольная да засваення вынікаў грэка-рым. (ант.) і ўсх. цывілізацый і паступальнага сац.-эканам., навук.-тэхн. і духоўна-творчага развіцця. Агульная колькасць прыхільнікаў Х. ў свеце перавышае 1 млрд. чалавек. Для хрысц. цывілізацыі характэрны погляд

Да арт. **Хрысціянства**. Ісус Хрыстос. Распяцце. Канец 14 ст.

на грамадскае быццё і культуру як на няспынныя працэсы, якія змяняюцца ў часе і прасторы, маюць набор прыкмет, спецыфічных для кожнай эпохі, рэгіёна і этн. супольнасці (гл. *Гістарызму прынцып*).

Афіцыйна Х. ўведзена ў рэгіёнах геапаліт. дамінавання Кіеўскай Русі, у т.л. ў Полацкім, Тураўскім, Смаленскім і інш. княствах, у 988 кіеўскім кн. *Уладзімірам Святаславічам*. Але рэальна новая рэлігія распаўсюджвалася ў сярэдневяковай Беларусі на працягу 2 стагоддзяў. Сярод балцка-літ. насельніцтва зах. і цэнтр. рэгіёнаў Беларусі Х. рыма-каталіцкага абраду ўведзена ў эпоху станаўлення *Вялікага княства Літоўскага* пры кн. *Ягайле* (канец 14 ст.). У гісторыі Х. ўсх. абраду (з сярэдзіны 11 ст. —

праваслаўя), каталіцызму, інш. канфесій вылучаюць 5 этапаў: першапачатковае асветніцтва (канец 10 — 1-я пал. 16 ст.), палемічны перыяд (2-я пал. 16 — 1-я пал. 17 ст.), дагматычны этап (з тэндэнцыяй да паланізацыі *рымска-каталіцкай царквы* і русіфікацыі правасл. царквы ў 2-й пал. 17 — пач. 20 ст. (гл. *Беларуская праваслаўная царква*), этап ганенняў на Х. (1920—80-я г.), сучасны этап хрысц. адраджэння. На 1-м этапе (асветніцкая дзейнасць *Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Клімента Смаляціча, Ф.Скарыны* і інш.) узнікла царк. і свецкая л-ра, у т.л. летапісная гістарыяграфія (гл. *Летапісы*), рукапісная і друкаваная кніжная культура. У палемічны перыяд у Рэчы Паспалітай узмацніўся каталіцкі касцёл, а праваслаўная царква страціла свой ранейшы ўплыў на дзярж. жыццё краіны. Тады ж узнік рэфармацыйны рух (гл. *Рэфармацыя*), пратэстанцкія канфесіі розных плыней. Рэліг. барацьба ўзмацнілася пасля заснавання на Беларусі калегіумаў Ордэна езуітаў і заключэння Брэсцкай уніі 1596 (гл. *Беларуская грэка-каталіцкая царква, Палемічная літаратура*). У дагматычны перыяд амаль 2 стагоддзі адбывалася палярызацыя праваслаўя і каталіцтва. Сярэднюю пазіцыю займала уніяцкая царква: у ёй з 18 ст. часткова страчваліся нац. традыцыі, абрад набліжаўся да рыма-каталіцкіх канонаў. Аднак як царква пераважна сельскага насельніцтва яна захавала элементы нар. культуры і родную мову. Невыпадкова з уніяцкіх дробнашляхецкіх і сял. сем'яў у 19 ст. выйшлі пачынальнікі новай бел. л-ры і дзеячы нац. адраджэння. У пач. 1920, калі значная тэр. Беларусі адышла да Польшчы (гл. *Рыжскі мірны дагавор 1921*), цэнтр рэліг.-асв. дзейнасці перамясціўся ў Зах. Беларусь. У БССР у 1920—30-я г. ў выніку антырэліг. заканадаўства, узвядзення атэізму ў ранг афіц. ідэалогіі большасць цэркваў і ўсе касцёлы былі зачынены, рэліг. арг-цыі пазбаўлены статусу юрыд. асобы, адбываліся рэпрэсіі супраць святароў і вернікаў. Агульнанац. хрысц.-рэліг. адраджэнне пачалося ў 1980-я г. пасля частковай лібералізацыі СССР і ўзмацнілася пасля абвяшчэння суверэннай Рэспублікі Беларусь (1991), прыняцця Закона «Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацый» (1992). За 1988—2002 колькасць правасл. абшчын вырасла з 370 да 1224; рымска-каталіцкіх — з 112 да 433; за апошнія 5 гадоў колькасць пратэстанцкіх абшчын павялічылася прыкладна на 50% і склала ў 2002 каля 1000 абшчын. Адраджаюцца манастыры, царк. і касцельнае асветніцтва, выходзяць праваслаўныя («Веснік Беларускага Экзархата», «Праваслаўе»), каталіцкія («Наша вера»), пратэстанцкія перыяд. выданні.

Літ.: Христианство: Энцикл. словарь. Т. 1—3. М., 1993—95; Кудрявцев В.В. Лекции по истории религии и свободомыслия. 2 изд. Мн., 1997; Ермаловіч М. Старажытная Беларусь: Полацкі і новагародскі перыяды. Мн., 1990; Короткая Т.П., Осипов А.И., Теплова В.А. Христианство в Беларуси: история и современность. Мн., 2000; Конан У. Хрысціянства ў гістарычным лёсе Беларусі // Беларуская думка XX ст.: Філасофія, рэлігія, культура: (Анталогія). Варшава, 1998. *У.М.Конан.*

ХРЫШЧЭ́ННЕ, адно з 7 хрысціянскіх *таінстваў*. Паводле царк. вучэння, пасля Х. чалавек прымаецца ва ўлонне царквы, «памірае для жыцця грэшнага і адраджаецца ў жыццё духоўнае, святое». Рытуал Х. заключаецца ў апусканні ў купель (у праваслаўі) ці ў паліванні вадой галавы таго, каго хрысцяць (у каталіцызме), міранамазанні, вымаўленні святаром строга вызначанага тэксту і надзяванні на ахрышчанага нацельнага крыжыка. З 8 ст. замацаваўся звычай хрысціць немаўлят; дапускаецца Х. і дарослых. Карані Х. ў стараж. водных ачышчальных абрадах. Пачатак Х. паклаў *Іаан Хрысціцель*, які хрысціў у р. Іардан Ісуса Хрыста. У раннехрысц. абшчынах Х. лічылі нараджэннем верніка «ад вады і Духа»; яно праводзілася міранамі, у т.л. жанчынамі (дыяканісамі), над людзьмі рознага ўзросту. Х. папярэднічала аскетычная падрыхтоўка. Паступова абрад Х. стаў выключнай прэрагатывай духавенства.

ХРЫШЧЭ́ННЕ РУСІ, увядзенне ў канцы 10 ст. *хрысціянства* як дзярж. рэлігіі *Кіеўскай Русі*. Кн. *Уладзімір Святаславіч* [980—1015] прыняў ад *Візантыі* ўсх. форму хрысціянства, якая ў 11 ст. пераўтварылася ў *праваслаўе*. «*Аповесць мінулых гадоў*» падае Х.Р. як акт хрышчэння жыхароў г. Кіеў грэч. свяшчэннікамі ў р. Дняпро ў 988, аднак рэальна гэты працэс расцягнуўся на стагоддзі. Хрысціянства ўсталёўвалася ў барацьбе, часам крывавай, з *язычніцтвам*. У 10—11 ст. у асн. ахрышчана насельніцтва гарадоў і прыгарадаў, да 13 ст. — сельскае насельніцтва. На Беларусі ўвядзенне хрысціянства традыцыйна прынята лічыць з 992 — часу стварэння *Полацкай праваслаўнай епархіі*. З пач. 11 ст. будаваліся пераважна драўляныя цэрквы, з сярэдзіны 11 ст. мураваныя, у т.л. *Полацкі Сафійскі сабор*, у 12 ст. цэрквы ў Ваўкавыску, Віцебску, Гродне, Навагрудку, Тураве і інш. Новая рэлігія садзейнічала станаўленню феад. адносін, умацаванню дзяржаўнасці, развіццю культуры, наладжванню сувязей з хрысц. краінамі, спрыяла пашырэнню пісьменства, перакладаў кніг з грэч. мовы, пачатку летапісання і інш.

Літ.: Как была крещена Русь. 2 изд. М., 1989; Гісторыя Беларусі. Т. 1. Мн., 2000.

Хрэн звычайны.

ХРЭ́Н (Armocaria), род кветкавых раслін сям. крыжакветных. 3 віды. Пашыраны ў Еўразіі. На Беларусі 1 від —

Да арт. **Хрышчэнне Русі**. Хрышчэнне вялікага князя кіеўскага Уладзіміра Святаславіча. Карціна В.М.Васняцова. 1880-я г.

Х. звычайны (A. rusticana). Трапляецца ўздоўж дарог, па берагах рэк і азёр, каля жылля. Культывуецца.

Х. звычайны — шматгадовая травяністая расліна з тоўстым верацёнападобным галінастым карэнішчам. Сцёблы выш. да 1 м, прамастойныя, галінастыя. Лісце ў прыкаранёвай разетцы, даўж. 30—100 см, чаранковае, каля асновы звужанае, ніжняе сцябловае на кароткіх чаранках, рассечанае або перыста-раздзельнае, верхняе — сядзячае, падоўжанае. Кветкі белыя, духмяныя. Плод — стручочак. Насенне звычайна не ўтвараецца, размнажэнне вегетатыўнае. У культуры — адна- і двухгадовыя расліны. Карэнішчы выкарыстоўваюцца як прыправа, маюць фітанцыдныя ўласцівасці. *В.М.Прохараў.*

Ц.М.Хрэннікаў.

ХРЭ́НАВЫ ГРЫБ, валуй несапраўдны, гебелома корачкападобная (Hebeloma crustuliniforme), шапкавы базідыяльны грыб сям. павуцінніковых. Пашыраны ў Паўн. паўшар'і, на Беларусі — паўсюдна. Трапляецца ў лясах і парках з ліп. па верасень.

Шапка пукатая, потым распасцёртая, слізістая, гліністая, бледная, дыям. 3—8 см. Пласцінкі прыросłыя, частыя, вузкія, з нярoўным краем і кроплямі вадкасці, бруднабурыя. Ножка амаль роўная, белаватая, даўж. 4—7 см. Мякаць вадзяністая, белая, горкая, з пахам рэдзькі або хрэну (адсюль назва). Споры эліпсоідныя, жаўтаватыя. Ядавіты.

ХРЭ́ННІКАЎ Ціхан Мікалаевіч (н. 10.6.1913, г. Ялец Ліпецкай вобл., Расія), расійскі кампазітар, грамадскі дзеяч. Нар. арт. СССР (1963). Герой Сац. Працы (1973). Ганаровы чл. Італьян. Тыберыйскай акадэміі (1976), чл.-кар. Нямецкай АМ (1978) і акадэміі «Санта-Чэчылія» (Італія, 1984). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1936; кл. В.Шабаліна), з 1961 выкладае ў ёй (з 1966 праф.). Для музыкі Х. характэрны меладычны пачатак у спалучэнні з багаццем сімф. развіцця. Сярод твораў: оперы «У буру» (паст. 1939; 2-я рэд. 1952), «Фрол Скабееў» (паст. 1950; 2-я рэд. «Бязродны зяць», паст. 1967), «Маці» (паст. 1957), «Залатое цяля» (паст. 1985); балеты «Каханнем за каханне» (паст. 1976), «Гусарская балада» (паст. 1979), «Напалеон Банапарт» (паст. 1995) і інш.; аперэты «Сто чарцей і адна дзяўчына» (паст. 1963), «Белая ноч» (паст. 1967); 3 сімфоніі (1935, 1944, 1974); канцэрты для фп. (1933, 1972, 1983), скрыпкі (1959, 1975) і віяланчэлі (1964, 1986) з сімф. аркестрам; п'есы для фп. і інш. інструментаў; рамансы, песні; музыка да драм. спектакляў, кінафільмаў «Свінарка і пастух», «Цягнік ідзе на Усход», «Верныя сябры», «Гусарская балада» і інш. У 1948—91 ген., 1-ы сакратар праўлення, старшыня Саюза кампазітараў СССР. Дзярж. прэміі СССР 1942, 1946, 1952, 1967. Ленінская прэмія 1974. Дзярж. прэмія Расіі імя М.Глінкі 1979.

Літ.: Воронцова И. О стиле и музыкальном языке Т.Н.Хренникова. М., 1983; Шехонина И.Е. Творчество Т.Н.Хренникова. М., 1985. *Т.А.Дубкова.*

ХРЭ́СЬБІННЫЯ ПЕ́СНІ, гл. ў арт. *Радзінныя песні.*

ХРЭ́СЬБІНЫ, гл. ў арт. *Радзіны.*

«ХТО ЁСЦЬ ХТО», серыя папулярных даведачных выданняў, у якіх змяшчаюцца біягр., адрасныя і інш. звесткі пра знакамітых людзей. Заснавальнік — амер. выдавец А.Н.Маркіз, які ў 1899 апублікаваў даведнік «Хто ёсць хто ў Амерыцы» (больш за 8,6 тыс. біяграфій). Паводле выпрацаванай ім методыкі, у даведнік уключаліся найб. вядомыя асобы (1 чал. ад 10 тыс. жыхароў ЗША). На працягу 20 ст. ён шмат разоў перавыдаваўся. У 1998 апубл. 52-е 3-томнае выданне ў друкаваным і электронным варыянтах, у якім змешчана больш за 100 тыс. біяграфій. Выдаюцца таксама штогод спецыялізаваныя даведнікі гэтай серыі: «Хто быў хто ў Амерыцы» (т. 1—13), «Хто ёсць хто ў свеце», «Хто ёсць хто ў навуцы і тэхніцы», «Хто ёсць хто ў амерыканскім мастацтве», «Хто ёсць хто ў амерыканскай палітыцы» і інш. У Англіі на ўзор амер. даведнікаў выдаюцца «Міжнародны хто ёсць хто» (52-е выд., 1988; уключае 18 тыс. біяграфій), «Міжнародны хто ёсць хто ў музыцы і музычных даведніках», «Хто ёсць хто ў старажытным свеце», «Міжнародны хто ёсць хто сярод аўтараў і пісьменнікаў» і інш. (выдаюцца штогод). Даведнікі серыі «Хто ёсць хто» пашыраны таксама ў Германіі, Бельгіі, Італіі, некат. краінах Азіі і Афрыкі. У пач. 1990-х г. такія даведнікі пачалі выдаваць у СССР: «Хто ёсць хто ў сусветнай палітыцы» (1990), «Хто ёсць хто ў рускім літаратуразнаўстве» (ч. 1—3, 1991—94) і інш. Сярод рас. выданняў гэтага тыпу: «Хто ёсць хто ў Расіі і ў блізкім замежжы» (1993), «Хто ёсць хто ў Расіі і ў былым СССР» Дж.Вронскай і В.Чугуева (1994), «Хто ёсць хто ў вывучэнні народаў і нацыянальных праблем Расіі» (1995). У ліку найб. поўных даведнікаў гэтай серыі ў СНД — укр. «Хто ёсць хто на Украіне» (1997; каля 2,5 тыс. біягр. даведак пра жыццё і дзейнасць вядомых дзеячаў Украіны). На Беларусі створаны даведнікі: «Энцыклапедыя фантастыкі: Хто ёсць хто» (1995), «Хто ёсць хто ў сучаснай беларускай лінгвістыцы» (1997), «Хто ёсць хто ў Рэспубліцы Беларусь», «Хто ёсць хто ў Рэспубліцы Беларусь: Спорт», «Хто ёсць хто ў Рэспубліцы Беларусь: Людзі справы» (усе 1999), «Хто ёсць хто ў Беларусі» (1999, 2001), «Хто ёсць хто сярод беларусаў свету. Ч. 1. Беларусы і ўраджэнцы Беларусі ў памежных краінах» (2000) і інш. *В.К.Шчэрбін.*

ХУА́ ГАФЭ́Н (н. 1920 або 1921, пав. Цзяачэн, прав. Шаньсі, Кітай), палітычны і дзярж. дзеяч Кітая. З 1949 на парт. і дзярж. рабоце ў прав. Хунань, дзе быў адным з кіраўнікоў *«культурнай рэвалюцыі»*; са снеж. 1971 1-ы сакратар правінцыяльнага к-та Камуніст. партыі Кітая (КПК). Чл. Палітбюро ЦК КПК у 1973—82. Са студз. 1975 нам. прэм'ера Дзярж. савета і (да ліст. 1977) міністр грамадскай бяспекі Кітая. Прэм'ер Дзярж. савета (крас. 1976 — вер. 1980), старшыня ЦК КПК (кастр. 1976 — чэрв. 1981). Пасля смерці *Мао Цзэдуна* (вер. 1976) арыштаваў яго ўдаву Цзянь Цын і 3 вышэйшых парт. кіраўнікоў («банду 4-х»), дазволіў рэабілітаваць Дэн Сяапіна (1977), але пацвердзіў асн. мааісцкія ўстаноўкі, не пайшоў на глыбокія эканам. рэформы і дэмакратызацыю паліт. жыцця. Заменены на пасадах прэм'ера і старшыні ЦК КПБ адпаведна *Чжао Цзыянам* і *Ху Яабанам.*

ХУАЙНА́НЬ, горад ва Усх. Кітаі, на р. Хуайхэ, у прав. Аньхой. 1,2 млн. ж. (1990). Цэнтр кам.-вуг. басейна. Прам-сць: чорная металургія, горнае машынабудаванне, выт-сць угнаенняў, гумавая, фармацэўтычная, папяровая. Буйная ЦЭС.

ХУАЙХЭ́, рака на У Кітая. Даўж. 813 км, пл. бас. 187 тыс. км^2. Вытокі ў гарах Тунбайшань, цячэ па Вял. Кітайскай раўніне. Асн. прыток — Інхэ. Сярэдні расход вады каля 1 тыс. м^3/с, макс. — 10—13 тыс. м^3/с. Нясе шмат наносаў, у выніку адкладвання якіх рэчышча ўзнімаецца (месцамі вышэй прылеглай раўніны). У мінулым Х. часта мяняла напрамак, упадала або ў Янцзы, або ў Хуанхэ, або ў Жоўтае м. Вядома буйнымі навадненнямі. Цяпер б.ч. сцёку (праз сістэму азёр і каналаў) паступае ў Янцзы. Выкарыстоўваецца для арашэння. Суднаходная ў ніжнім цячэнні. Злучана *Вялікім каналам* з рэкамі Янцзы і Хуанхэ. На Х. гарады Хуайнань, Бэнбу.

ХУА́Н БІНЬХУ́Н, Чжы, Пу Цун (псеўд. Юй Сін; 1864, правінцыя Аньхой, Кітай — 25.3.1955), кітайскі жывапісец. Працаваў пераважна ў Шанхаі і Ханчжоў. Творы ў манеры *гохуа.* Імкнуўся развіць і ўзбагаціць метады класічнага пейзажнага кіт. жывапісу: «Запруда ў павеце Ісянь» (1909), «Гара Цяньтайшань» (1928), «У гарах Эмей» (1934), «Снег з дажджом у вясеннюю пару» (1940), «Від на храм Юньгусы» (1954). Вядомы таксама як каліграф, паэт і тэарэтык мастацтва. Аўтар «Збору матэрыялаў па выяўленчым мастацтве» (т. 1—20, 1911).

ХУА́Н КА́РЛАС I (Juan Carlos; н. 5.1.1938, Рым), кароль Іспаніі (з 1975) з дынастыі *Бурбонаў.* Унук скінутага ў 1931 караля Іспаніі Альфонса XIII. Жыў

у Італіі, Швейцарыі, Партугаліі. Па прапанове Ф.*Франка Баамондэ* ў 1948 вярнуўся ў Іспанію. Скончыў мадрыдскі каледж «Сан-Ісідра» (1954), вучыўся ў ваенна-марскіх і авіяц. вучылішчах (1955—59), Мадрыдскім ун-це (1960—62). 23.7.1969 афіцыйна абвешчаны пераемнікам Франка, пасля яго смерці — кіраўніком дзяржавы з тытулам караля. Адыграў важную ролю ў пераходны перыяд ад франкісцкай дыктатуры да дэмакр. ладу (вызвалены паліт. зняволеныя, легалізаваны ўсе паліт. партыі і прафсаюзы, распушчаны франкісцкі Нац. рух). З'яўляецца галоўнакамандуючым узбр. сіламі краіны, ажыццяўляе прадстаўнічыя функцыі. Паводле канстытуцыі Іспаніі (1978) мае шырокія паўнамоцтвы (склікае і распускае парламент, прызначае з ведама парламента кіраўніка ўрада).

ХУАНПУ́ ШКО́ЛА, Вампу школа, ваенная школа для падрыхтоўкі афіцэрскіх кадраў Кітая ў 1924—27. Арганізавана *Сунь Ятсенам* у супрацоўніцтве з камуністамі ў маі 1924 каля г. Гуанчжоў на в-ве Хуанпу (Вампу). У стварэнні Х.ш. аказвалі дапамогу сав. ваен. спецыялісты на чале з В.К.*Блюхерам*, а таксама паліт. саветнікам *Гаміньдана* М.М.*Барадзіным*. У пач. 1927 пераведзена ў г. Ухань (закрыта ў жн. 1927). Выпускнікі Х.Ш. адыгралі важную ролю ў *Паўночным паходзе 1926—28*.

ХУАНПУ́СКІ ДАГАВО́Р 1844, дагавор, навязаны Францыяй Кітаю. Падпісаны 24.10.1844 на борце франц. карабля ў гавані в-ва Хуанпу (адсюль назва). Х.д. пашырыў на Францыю і яе падданых тыя правы і прывілеі, якія атрымалі ў Кітаі Вялікабрытанія і ЗША паводле *Нанкінскага дагавора 1842*, Вансяскага дагавора 1844 і т.зв. «Дадатковага пратакола» 1843.

ХУА́Н СІН (25.10.1874, г. Чанша, Кітай — 31.10.1916), кітайскі рэвалюцыянер. Заснавальнік (1904) і кіраўнік рэв. т-ва Хуасінхай, адзін з заснавальнікаў (1905) і найб. уплывовы пасля *Сунь Ятсена* лідэр агульнакітайскай рэв. арг-цыі *Тунмэнхой*. У 1907—10 арганізаваў шэраг узбр. выступленняў у правінцыях Гуандун, Гуансі, Юньнань. У крас. 1911 узначаліў Хуанхуаганскае паўстанне ў Гуанчжоў. Адзін з кіраўнікоў Сіньхайскай рэвалюцыі 1911—13. У студз.—сак. 1912 ваен. міністр Нанкінскага рэсп. ўрада. Уплывовы дзеяч створанай у жн. 1912 партыі *Гаміньдан*. Прымаў удзел у «другой рэвалюцыі» (летам 1913), але ў ліп. 1913 пакінуў шэрагі паўстанцаў і выехаў у Японію, потым — у ЗША. У 1916 вярнуўся ў Кітай.

ХУАНХА́Й, кіт. назва *Жоўтага мора*.

ХУАНХЭ́, Жоўтая рака, рака на У Кітая, адна з найб. рэк Азіі. Даўж. 4845 км, пл. бас. 771 тыс. км^2 (паводле інш. звестак, адпаведна 4670 км і 745 тыс. км^2). Пачынаецца на У Тыбецкага нагор'я на выш. больш за 4 тыс. м, цячэ праз азёры Арын-Нур і Джарын-Нур. Скразнымі цяснінамі прарывае адгор'і Куньлуня і Наньшаня, утварае парогі і вадаспады. У сярэднім цячэнні агінае плато Ордас, перасякае і размывае Лёсавае плато. Ніжэй, у глыбокіх цяснінах, прарываецца праз Шаньсійскія горы і на працягу 700 км цячэ па Вял. Кітайскай раўніне. Упадае ў заліў Бахайвань Жоўтага м., утварае дэльту. Асн. прытокі: Датунхэ, Фыньхэ, Цыньхэ (злева), Таахэ, Вэйхэ, Лахэ (справа). Сярэдні расход вады каля 2000 м^3/с. Рэжым мусонны, летняя паводка з пад'ёмам узроўню на раўнінах на 4—5 м, у гарах — да 15—20 м. Выносіць штогод 1300 млн. т наносаў. Вада мутная, жоўтая (адсюль назва). У ніжнім цячэнні ў выніку намнажэння наносаў рэчышча прыўзнята над раўнінай на 3—10 м. Для аховы ад навадненняў Х. і яе прытокі абвалаваны дамбамі (даўж. каля 5 тыс. км). Нярэдка прарывае дамбы, перамяшчае рэчышча (да 800 км), учыняе катастрафічныя паводкі. Выкарыстоўваецца для арашэння. ГЭС Люцзяся і Саньмынься. Злучана *Вялікім каналам* з р. *Хуайхэ*. Суднаходная на асобных участках (пераважна на Вял. Кітайскай раўніне). Даліна Х. густа населена. На Х. буйныя гарады: Ланьчжоў, Баатоў, Лаян, Чжэнчжоў, Кайфын, Цзінань.

Рака Хуанхэ каля г. Чжэнчжоў.

ХУА́Н ЧА́О ПАЎСТА́ННЕ 874—901, сялянская вайна пад кіраўніцтвам Хуан Чао, народнае паўстанне ў Кітаі пад кіраўніцтвам Хуан Чао супраць дынастыі *Тан*. Выкліканa рэзкім пагаршэннем становішча нар. мас. Пачалося ў 874 з сялянскіх выступленняў у міжрэччы Хуанхэ і Янцзы пад кіраўніцтвам Ван Сяньчжы. У 875 да яго далучыўся атрад на чале з Хуан Чао, які з 878 узначаліў паўстанне. У 879 ён захапіў г. Гуанчжоў, у 881 — сталіцу імперыі — г. Чан'ань, дзе абвясціў сябе імператарам дзяржавы Вялікае Цы. Але няздольнасць Хуан Чао арганізаваць дзярж. ўладу і парадак прывяла да падзення яго аўтарытэту, што дазволіла танскаму ўраду сумесна з качэўнікамі ў 883 выбіць Хуан Чао з Чан'аня. У 884 ён скончыў самагубствам, але асобныя атрады супраціўляліся да 901. Х.Ч.п. падарвала сілы Танскай дынастыі, і ў 907 яна скінута адным з б. паплечнікаў Хуан Чао. *В.У.Адзярыха.*

ХУА́РЭС ГАРСІ́Я (Juárez García) Беніта Пабла (21.3.1806, Сан-Пабла-Гелатао, Мексіка — 18.7.1872), дзяржаўны і паліт. дзеяч, нац. герой Мексікі. З сялянскай сям'і індзейцаў-*сапатэкаў*. Скончыў духоўную семінарыю (1827) і юрыд. школу (1833) у г. Аахака. У 1847—52 губернатар штата Аахака. Удзельнік *амерыкана-мексіканскай вайны 1846—48*, апазіцыі (у 1853 высланы з краіны) і рэв. вайны 1854—55 супраць дыктатуры А.Санта-Аны. Пасля яго звяржэння міністр юстыцыі і культаў (1855); ініцыіраваў закон 1855 аб скасаванні *фуэрас* (прывілеяў духавенства і афіцэраў). Адзін са стваральнікаў дэмакр. канстытуцыі 1857. У 1858—61 кіраўнік ліберальнага ўрада (часовы прэзідэнт краіны), які выдаў антыклерыкальныя законы 1859, перамог кансерватараў і клерыкалаў у грамадз. вайне 1858—60. Прэзідэнт Мексікі ў 1861—72. У перыяд англа-франка-ісп. інтэрвенцыі (гл. *Мексіканская экспедыцыя 1861—67*) кіраваў барацьбой мекс. патрыётаў супраць інтэрвентаў і іх памагатых. Клапаціўся аб захаванні помнікаў культуры даіспанскай Мексікі.

Літ.: Гордин Я.А. Три войны Бенито Хуареса: Повесть о выдающемся мексик. революционере. М., 1984. *Ю.В.Бажэнаў.*

ХУ́БАІ (Hubay) Енё [сапр. Хубер (Huber) Эўген; 15.9.1858, Будапешт — 12.3.1937], венгерскі скрыпач, кампазітар, педагог. Вучыўся ў свайго бацькі К.Хубаі, у Вышэйшай муз. школе ў Берліне (1871—76). З 1876 канцэртаваў як саліст, у т.л. ў ансамблі з Ф.Лістам, Ж.Серве і інш. З 1882 выкладаў у Брусельскай кансерваторыі, з 1886 у Муз. акадэміі ў Будапешце (у 1919—34 яе дырэктар). Сярод твораў: оперы, у т.л. «Ганна Карэніна» (паст. 1915), «Венера Мілоская» (паст. 1935); балеты, у т.л. «Вялікі эгаіст» (паст. 1936); 4 сімфоніі,

4 канцэрты для скр. з арк., транскрыпцыі фп. п'ес Ліста і інш.

ХУ́БЕЛЬ Карл (Лукаш; 1722—93), мастак 18 ст. Мяркуюць, што ён размаляваў інтэр'ер касцёла ў в. Гарадніца (цяпер у межах Гродна), куды быў запрошаны А.Тызенгаўзам каля 1765.



Б.П.Хуарэс Гарсія.

Дз.М.Худакормаў.

ХУ́БЕР, Губер (Huber) Вольф (Вольфганг; каля 1485, г. Фельдкірх, Аўстрыя — 3.6.1553), аўстрыйскі мастак; адзін з вядучых майстроў *дунайскай школы*. Працаваў пераважна ў г. Пасаў. Паслядоўнік А.*Альтдорфера*. У алтарных кампазіцыях і пейзажных малюнках спалучаў рысы позняй готыкі і мастацтва Адраджэння. Евангельскія сцэны перадаваў у эмацыянальна-лірычным плане і размяшчаў іх на фоне паэт. ландшафтаў, якія вылучаюцца тонкасцю і мяккасцю святлоценявых градацый: «Маленне аб

В.Хубер. Уцёкі ў Егіпет.

чашы», «Уцёкі ў Егіпет», алтар брацтва св. Ганны з «Аплакваннем Хрыста» (1521). Некат. творам уласцівы рысы іроніі, часам гратэску («Укрыжаванне»).

«ХУ́БЕРТУС» («Hubertus»), кодавая назва карнай аперацыі ням. фашыстаў супраць партызан і насельніцтва абапал чыг. лініі Васілевічы—Рэчыца ў Васілевіцкім, Калінкавіцкім, Рэчыцкім, Хойніцкім р-нах у Вял. Айч. вайну. Праводзілася ў 2 этапы ў кастр. і ліст. 1943 сіламі 862-га і 628-га ахоўных батальёнаў, 582-га дывізіёна палявой жандармерыі, асобных рот і батальёнаў 47-га ландвернага, 57, 608, 613-га ахоўных палкоў і інш. Пасля няўдалых аперацый «Барбара» і «Асвячэнне храма» (абедзве ў кастр.) у гэтых раёнах гітлераўцы вырашылі блакіраваць Гомельскае партыз. злучэнне ва Узнажскім лесе, знішчыць партызан і мясц. жыхароў, што знаходзіліся пад іх абаронай. У кастр. на працягу сутак партызаны ўтрымлівалі рубяжы абароны, але з заканчэннем боепрыпасаў частка іх адышла разам з насельніцтвам і параненымі па плывучым мосце цераз Бярэзіну, там іх выявіла сав. авіяразведка, некалькі ваенна-трансп. самалётаў даставілі ім боепрыпасы і адправілі за лінію фронту параненых. Падмацаваныя ўзбраеннем партызаны вярнуліся на ранейшае месца базіравання на дапамогу абаронцам, таму акупанты прыпынілі аперацыю для перагрупоўкі сіл. Атрымаўшы ў падмацаванне 2 ахоўныя батальёны і бранятанк. штурмавую групу, карнікі ў ліст. пачалі 2-гі этап аперацыі, але з-за адчувальных страт ў жывой сіле і тэхніцы спынілі аперацыю.

У.С.Пасэ.

ХУБІЛА́Й (манг. пасмяротны тытул Сэчэн-хан, кіт. храмавае імя Шы-цзу; 23.9.1215 — 18.11.1294), пяты вялікі хан *Мангольскай імперыі* [1260—94], унук *Чынгісхана*. Пасля смерці *Мункэ* захапіў ханскі прастол. У 1260 перанёс сталіцу на тэр. Кітая (напачатку ў г. Кайпін, у 1264 у г. Чжунду — сучасны Пекін). У снеж. 1271 надаў манг. дынастыі чынгісідаў кіт. назву Дай Юань (гл. *Юань*). У 1279 завяршыў заваяванне ўсяго Кітая. Ваен. экспедыцыі Х. ў Японію (1274 і 1281), на Яву (1293), паходы ў В'етнам (1257—88), Бірму (М'янму; 1277—87) былі няўдалыя. На службе ў Х. быў падарожнік М.*Пола*.

ХУ́БЛІ-ДХА́РВАР, Дхарвар, горад у Паўд. Індыі, у штаце Карнатака. 648 тыс. ж. (1991). Трансп. вузел. Гандл.-прамысл. цэнтр. Прам-сць: маш.-буд., баваўняная, мылаварная, гарбарная.

ХУБСУГУ́Л, Касагол, возера на Пн Манголіі, у міжгорнай упадзіне каля паўд. адгор'яў Саян, на выш. 1645 м. Пл. 2620 км^2, даўж. 134 км, шыр. да 36 км, глыб. да 238 м. Берагі пераважна высокія, абрывістыя. Замярзае са снеж. па май. Выцякае р. Эгійн-Гол (бас. р. Селенга). Суднаходства. Рыбалоўства.

ХУБЭ́Й, правінцыя на ПдЗ Кітая, у сярэднім цячэнні р. Янцзы. Пл. 187,4 тыс. км^2. Нас. 59,75 млн. чал. (2001). Адм. цэнтр — г. *Ухань*. Размешчана ў межах Цзянханьскай раўніны, на У адгор'і хр. Дабашань (выш. да 3052 м). Клімат субтрапічны, мусонны. Гал. р. Янцзы. Шмат азёр. Аснова эканомікі — сельская гаспадарка. Арашаецца каля 50% пасяўной плошчы. Гал. культура — рыс. Вырошчваюць пшаніцу, ячмень, кукурузу, бавоўнік, рамі, кунжут, арахіс, рапс, чай, тытунь. Пладаводства (цытрусавыя, яблыкі, грушы). Гадуюць буйн. раг. жывёлу (выкарыстоўваецца пераважна як цяглавая сіла), свіней, птушак. Рыбаводства. Нарыхтоўка пладоў тунгавага дрэва, драўніны. Здабыча жал. руды і руд каляровых металаў. Прам-сць: чорная і каляровая металургія, машынабудаванне (цяжкае, энергет., радыётэхн. і інш.), хім., тэкст., харч., вытв-сць буд. матэрыялаў. Асн. прамысл. цэнтры: Ухань, Хуаншы, Сянфань, Ічан. Суднаходства па р. Янцзы і яе прытоках.

ХУВЕНТУ́Д [Isla de la Juventud; да 1978 наз. Пінас (Pinos)], востраў у Карыбскім м., за 65 км на Пд ад в-ва Куба. Спец. муніцыпія Рэспублікі Куба. Пл. 2,2 тыс. км^2. Нізінная слабарасчлянёная раўніна з астанцовымі ўзвышшамі выш. да 303 м (г. Ла-Каньяда). Клімат трапічны з сухой зімой. Ападкаў 1200 мм за год. Трапічныя лістападна-вечназялёныя і хваёвыя лясы, уздоўж узбярэжжа — мангравыя зараснікі. Вял. балоты. Рэзерват Сьенага-дэ-Сапата. Плантацыі цытрусавых. Жывёлагадоўля. Здабыча кааліну і мармуру. Гал. горад — Нуэва-Херона. Адкрыты ў 1494 Х.*Калумбам*.

ХУДАЙНАЗА́РАЎ Бердыназар (15.4.1927, с. Кізіл-Сакал, Туркменістан — 14.11.2001), туркменскі пісьменнік. Нар. пісьменнік Туркменістана (1984). Аўтар паэт. зб-каў «Песня пра чалавека» (1964), «Чалавек на вяршыні эпохі» (1968), «Ганаровая галава» (1975), «Мацярынскае малако» (1978), паэм «Гарачы стэп» (кн. 1—2, 1957—58), «Люблю цябе, жыццё» (1966), рамана «Людзі пяскоў» (1970), аповесцей «Поле бітвы» (1962), «Песня бягучай вады» (1973), «Вочы следапыта» (1979), п'ес. На бел. мову яго асобныя творы пераклалі Р.Барадулін, М.Татур.

Тв.: Рус. пер. — Люди песков: Роман, повести. Мн., 1981; Приглашение в Каракумы: Стихи. М., 1982.

ХУДАКО́РМАЎ Дзмітрый Мікалаевіч (н. 28.8.1924, с. Звягіна Пушкінскага р-на Маскоўскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне металургіі ліцейных сплаваў. Д-р тэхн. н. (1968), праф. (1969). Засл. дз. нав. (1992). Чл. Нью-Йоркскай АН (1997). Скончыў Маскоўскі аўтамех. ін-т (1950). З 1960 нач. лабараторыі Мінскага філіяла НДІ аўтамаб. прам-сці, з 1964 у Бел. нац. тэхн. ун-це (у 1968—94 заг. кафедры, адначасова ў 1971—76 прарэктар). Навук. працы па пытаннях павышэння якасных характарыстык ліцейных сплаваў. Распрацаваў электронную тэорыю мадыфікавання чыгуноў, тэарэт. асновы структураўтварэння пры зацвердзяванні і тэрмічнай апрацоўцы адлівак. Дзярж. прэмія Беларусі 1978.

Тв.: Роль примесей в процессе графитизации чугунов. Мн., 1968; Производство отливок из чугуна. Мн., 1987.

ХУДАЛЕ́ЕЎ Рыгор Аляксандравіч (22.2.1902, в. Ізабеліна Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл. — 4.7.1964), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Аб'яднаную бел. ваен. школу імя ЦВК БССР (1930), Вышэйшыя акад. курсы (1947). У Чырв. Арміі з 1924. У Вял. Айч. вайну на фронце з 1941, нач. штаба артыл. палка. Удзельнік абароны Нясвіжа, Слуцка,

Р.А.Худалееў.

Крычава, Клімавіч, Маскоўскай бітвы 1941—42, вызвалення Беларусі, Літвы, Латвіі, Польшчы. Артылерысты стралк. дывізіі на чале з палк. Х. вызначыліся ў 1944 пры прарыве абароны праціўніка каля г.п. Шуміліна, фарсіраванні Зах. Дзвіны і вызваленні г.п. Бешанковічы. Да 1955 у Сав. Арміі.

ХУДАЎЦЫ́, вёска ў Крупскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр Крупскага с/с і калгаса. За 7 км на Пн ад горада і 11 км ад чыг. ст. Крупкі, 124 км ад Мінска. 421 ж., 157 двароў (2003). Сярэдняя школа-сад, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — Багародзіцкая царква (2-я пал. 19 ст.).

ХУДЖА́НД, Х а д ж э н т, горад, цэнтр Сагдыйскай вобл., у Таджыкістане, на р. Сырдар'я. 164 тыс. ж. (1999). Чыг. станцыя. Прам-сць: лёгкая (шаўковая, швейная, трыкат., абутковая, бавоўнаачышчальная), харч. (кансервавая, малочная, кандытарская), машынабудаванне і металлаапрацоўка, мэблевая, выт-сць буд. матэрыялаў. Грэнажны з-д. Пед. ін-т. Тэатр. Музеі: археал. і гіст.-краязнаўчы. Бат. сад. Сярэдневяковая цытадэль, руіны маўзалея Туба-хана (14 ст.), мячэць-маўзалей шэйха Муслехеддзіна (17—18 ст.), саборная мячэць (1912—13) з мінарэтам (19 ст.) і інш.

Паселішча на месцы Х. вядома з 6 ст. да н.э. У 4 ст. да н.э. завяваны Аляксандрам Македонскім, які заснаваў тут горад-крэпасць Александрыя Крайняя. З 7 ст. н.э. наз. Х., цэнтр гандлю, рамяства, навукі, праз які праходзіў *Вялікі шаўковы шлях*. У 711 разбураны арабамі, у 13 ст. — войскамі Чынгісхана. З 1710 у складзе Какандскага ханства. У 1866 заняты рас. войскамі, далучаны да Туркестанскага ген.-губернатарства. У Х. пачалося *Сярэднеазіяцкае паўстанне 1916*. У 1917 тут створаны Выканком рас. Часовага ўрада. У 1929 у складзе Хаджэнцкай акругі далучаны да Тадж. ССР. У 1936—91 наз. Ленінабад.

Літ.: История Ленинабада. Душанбе, 1986; Т р о п ы н и н Г.Д. Ленинабад: Немая книга древней старины. Таллин, 1986.

ХУЗАНГА́Й Педэр (Пётр Пятровіч; 9.1.1907, с. Хузангаева Алькееўскага р-на, Татарстан — 4.3.1970), чувашскі паэт. Нар. паэт Чувашыі (1950). Скончыў Літ. ін-т імя М.Горкага ў Маскве (1957). Друкаваўся з 1924. Першы зб. вершаў «Пасля навальніцы» (1928). Аўтар зб. вершаў «Песня сэрца» (1952), ліра-эпічных паэм «Дваццаць шэсць» (1930), «Магніт-гара» (1933), «Таня» (1942), «Вялікае сэрца» (1960), рамана ў вершах «Сям'я Аптрамана» (1946), адзін з раздзелаў якога прысвечаны Я.Купалу. На бел. мову яго асобныя творы пераклалі В.Лукша, П.Прыходзька, Ю.Свірка, М.Чарняўскі. Дзярж. прэмія Чувашыі імя К.В.Іванова 1967.

Тв.: Рус. пер. — Избранное. Т. 1—2. Чебоксары, 1958; Стихи. М., 1962; Дальний полет. М., 1972; Судьба: Стихи и поэма. М., 1974.

Літ.: Ф е т и с о в М.И. Народный поэт Чувашии П.П.Хузангай. Чебоксары, 1957.

ХУ́КАР (Júcar), рака на У Іспаніі. Даўж. 498 км, пл. бас. 22,4 тыс. км^2. Пачынаецца ў адгор'ях Іберыйскіх гор, перасякае плато Ла-Манча і Валенсійскую нізіну, упадае ў Валенсійскі заліў Міжземнага мора. Павышаная воднасць зімой і вясной. Сярэдні расход вады каля 40 м^3/с. Выкарыстоўваецца пераважна для арашэння. ГЭС. На Х. гарады Куэнка, Альсіра.

ХУЛАГУ́ІДАЎ ДЗЯРЖА́ВА, І л ь х а н а ў д з я р ж а в а. Існавала ў 1256 — сярэдзіне 14 ст. на Б. і Сярэднім Усходзе. Утварылася ў выніку распаду *Манголькай імперыі*; уключала Іран, б.ч. Афганістана, Туркменістана, Закаўказзя, Ірак Арабскі і ўсх. ч. М.Азіі. Засн. ханам Хулагі (унук *Чынгісхана*), які ў 1263 атрымаў ад вял. хана Хубілая тытул ільхана (уладара народаў, адсюль другая назва дзяржавы). Васаламі і данікамі Х.дз. былі Грузія, Трапезундская імперыя, *Канійскі султанат*, Кілікійскае арм. царства, Кіпрскае каралеўства, дзяржава Куртаў. Была нетрывалым ваен. аб'яднаннем. Ваявала з Чагатайскім улусам, *Залатой Ардой*, мамлюкскімі султанамі Егіпта; заключала саюзы з рым. папам, Генуяй, каралямі Францыі і Англіі. Пастаянныя феад. міжусобіцы, супраціўленне мясц. насельніцтва аслаблялі Х.дз. Рэформы А.Газан-хана [1295—1304] з мэтай стабілізаваць становішча не мелі поспеху. У сярэдзіне 14 ст. Х.дз. распалася на дробныя самаст. ўладанні.

ХУЛІГА́НСТВА, злачынства супраць грамадскага парадку і грамадскай маральнасці. Заключаецца ў наўмысных дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак і паказваюць яўную непавагу да грамадства, суправаджаюцца выкарыстаннем насілля, пагрозай яго ўжывання, знішчэннем ці пашкоджаннем чужой маёмасці. Абцяжваючыя акалічнасці Х.: выключны цынізм або супраціўленне асобе, якая спрабуе прадухіліць парушэнне грамадскага парадку, а таксама Х., якое ўчынена паўторна ці групай асоб, спалучанае з нанясеннем цялеснага пашкоджання (злоснае Х.), з выкарыстаннем зброі ці інш. прадметаў, прыстасаваных для гэтай мэты (асабліва злоснае Х.). Паводле КК Рэспублікі Беларусь караецца грамадскімі работамі, штрафам, арыштам, пазбаўленнем волі да 2 гадоў, або яе абмежаваннем у выключных выпадках — ад 3 да 7 гадоў. Х., якое не мае такіх прыкмет, разглядаецца як дробнае і цягне за сабой адм. адказнасць. *Э.І.Кузьмянкова.*

ХУМ, вялікая (выш. 1,5 м) гліняная пасудзіна для захоўвання вады ці харч. запасаў найчасцей звужаная ў дне. Здаўна пашыраны ў побыце насельніцтва Сярэдняй Азіі. Сучасныя Х. вырабляюць з ручкамі, унутры пакрываюць палівай.

ХУМПА́Н, у рэлігіі і міфалогіі стараж. Элама вярхоўны бог, валадар неба. Вавіланяне атаясамлівалі его з *Мардукам*.

ХУНА́НЬ, правінцыя ў Кітаі, у бас. сярэдняга цячэння р. Янцзы. Пл. 210 тыс. км^2. Нас. 65,96 млн. чал. (2001). Адм. ц. — г. *Чанша*. Цэнтр. і ўсх. часткі раўнінныя, на З ускраіна Гуйчжоўскага нагор'я, на Пд адгор'і Наньліна. Клімат субтрапічны, мусонны. Буйныя рэкі — Янцзы (на Пн), Юаньцзян, Цзышуй, Сянцзян. Х. — рысавая жытніца краіны, асн. плошчы на раўніне вакол воз. Дунтыньху. Вырошчваюць кукурузу, пшаніцу, ячмень, рамі, бавоўнік, чай, рапс, арахіс, джут, тытунь. Садоўніцтва (пераважна цытрусавыя). Гадуюць рабочую жывёлу, свіней. Птушкагадоўля. Рыбалоўства. Нарыхтоўка драўніны (*кунінгамії*). Здабыча сурмы, свінцова-цынкавых руд, вальфраму, марганцу. Прам-сць: чорная і каляровая металургія, машынабудаванне (горнае, трансп., с.-г., элетратэхн. абсталяванне, электравозы, вагоны, станкі), хім. (мінер. ўгнаенні, гумавыя вырабы), лёгкая, харч., у т.л. рысаачышчальная. Саматужныя промыслы. Асн. прамысл. цэнтры: Чанша, Сянтань, Хэн'ян, Чжучжоў, Іян.

ХУНВЭЙБІ́НЫ (кіт. — чырвоныя ахоўнікі, чырвонагвардзейцы), удзельнікі створаных у 1966 у час *«культурнай рэвалюцыі»* ў Кітаі атрадаў з навучэнцаў школ і ВНУ. Выкарыстоўваліся разам з *цзаафанямі* для правядзення кампаніі тэрору і пагроз супраць паліт. праціўнікаў *Мао Цзэдуна*. Калі патрэба ў Х. адпала, мааісцкія ўлады выдалілі іх (з 1968) з паліт. арэны, многія былі саслані на перыферыю. Пазней злачынствы Х. афіцыйна асуджаны ў Кітаі.

ХУНЕДАА́РА (Hunedoara), горад на З Румыніі, на р. Чэрна. 88 тыс. ж. (1985). Прам-сць: чорная металургія і коксахімія, трыкат., швейная, харчовая. Замак Хуньядзі (15 ст.).

ХУН СЕН (н. 4.4.1951, г. Кампонгсаам, Камбоджа), дзяржаўны і паліт. дзеяч Камбоджы. Удзельнік барацьбы супраць рэжыму Лон Нола (з 1970), адзін з кіраўнікоў паўстання 1977—78 супраць рэжыму *«чырвоных кхмераў»*. З 1979 чл. кіраўніцтва, з 1980-х г. фактычны лідэр Нар. партыі Камбоджы. З 1979 міністр замежных спраў, адначасова з 1981 нам. старшыні, з 1985 старшыня Савета міністраў. З 1993 прэм'ер-міністр ва ўрадзе кароля *Нарадома Сіянука*.

ХУН СЮЦЮА́НЬ (1.1.1814, пав. Хуасянь, правінцыя Гуандун, Кітай — 30.6.1864), арганізатар і вярх. кіраўнік *Тайпінскага паўстання* 1850—64 у Кітаі. З мэтай падрыхтоўкі паўстання ў 1843 заснаваў Таварыства пакланення богу (Байшандзіхай). Летам 1850 па яго загадзе члены Т-ва паўсталі ў р-не Цзіньцяня (правінцыя Гуансі), затым Х.С. абвясціў стварэнне Нябеснай дзяржавы вял. росквіту (Тайпін цяньго). У 1853 адышоў ад кіраўніцтва паўстаннем і стаў займацца гал. чынам рэліг. пытаннямі. Напярэдадні разгрому тайпінаў скончыў жыццё самагубствам (прыняў яд).

ХУ́НТА (ісп. junta літар. — сход, аб'яднанне), назва розных грамадска-паліт. арганізацый, саюзаў, камісій, аб'яднанняў, дзярж. органаў у краінах, дзе пашырана ісп. мова; у некат. краінах Лац. Амерыкі абазначэнне ваен. ўрада, які прыйшоў да ўлады ў выніку дзярж. перавароту (ваен. Х.). Часам тэрмін «Х.» ўжываецца ў іншасказальнай (алегарычнай) форме для назвы рэакцыйных груповак, рэжымаў, ваен. клікі.

ХУ́НЬЯДЗІ, Хунядзі, Гуніядзі (Hunyadi) Янаш (каля 1407—09 — 11.8.1456), венгерскі палкаводзец і дзярж. дзеяч, бацька венг. кароля *Мацьяша Хуньядзі*. У 1439—46 правіў шэрагам абласцей Венг. каралеўства, у т.л. Трансільваніяй. У барацьбе за прастол пасля смерці кароля Альбрэхта II Габсбурга (1439) падтрымаў кандыдатуру польскага кароля *Уладзіслава III* [1434—44, з 1440 адначасова венг. кароль Уласла I] і разграміў прыхільнікаў *Габсбургаў*. З пач. 1440-х г. узначальваў барацьбу венграў, румынаў і балканскіх народаў супраць тур. агрэсіі. У 1442 разбіў туркаў пад Бялградам і на р. Яламіца (у Валахіі), у 1443—44 разам з Уладзіславам III узначальваў крыжацкае войска (венгры, палякі, валахі і інш.), якое вызваліла ад туркаў Сербію, Боснію і ч. Балгарыі, але 10.11.1444 было разбіта тур. войскам каля г. Варна, дзе загінуў і Уладзіслаў III. У 1444—56 фактычны правіцель (у 1446—52 рэгент) Венг. каралеўства пры малалетнім каралю Ласла V. У 1448 разбіты туркамі на *Косавым полі*, але ў 1454 пасля шэрагу перамог зноў вызваліў ад іх Сербію, у ліп. 1456 разбіў пад Бялградам войска тур. султана *Мехмеда II*, што да 1521 спыніла тур. агрэсію супраць Венгрыі. Памёр ад чумы.

М.Г.Нікіцін.

ХУРА́Л, органы дзярж. улады ў Манголіі; таксама прадстаўнічыя органы ўлады ў некат. рэспубліках Рас. Федэрацыі (Тыва, Бурацыя). У Манголіі існуюць вышэйшы дзярж. Х. (вышэйшы орган дзярж. улады), у яе адм.-тэр. адзінках — Х. нар. дэпутатаў у аймаках, самонах, гарадах, багах (вёсках).

ХУРАМІ́ТЫ, хурамдзіны, удзельнікі барацьбы супраць Арабскага халіфата і ісламу ў Іране, Азербайджане і Сярэдняй Азіі ў 8—9 ст. Былі прыхільнікамі маздакізму (гл. *Маздакіцкі рух*), выступалі за сац. роўнасць. Х. былі пераважна сяляне, рамеснікі і гар. беднята. Удзельнічалі ў шэрагу паўстанняў, у т.л. пад кіраўніцтвам *Абу Мусліма* (747—750), у *Муканы паўстанні* (770—780-я г.) і *Бабека паўстанні* (9 ст.).

ХУ́РГІНАС (Churginas) Алексіс (7.6.1912, г. Іонава, Літва — 4.5.1990), літоўскі паэт, перакладчык. Вучыўся ў Каўнаскім ун-це (1931—36), у Сарбоне і Грэноблі (да 1939). Друкаваўся з 1929. У зб-ках паэзіі «Агонь» (1946), «Сонечнай сцежкаю» (1947), «І ў сэрцы тваім» (1970), «Вір» (1973), «Крыніца» (1978), «Верасовы мёд» (1981), «Азарэнне» (1984) і інш. патрыят. і антываен. тэматыка, матывы інтымных перажыванняў, паэтызацыя гуманіст. ідэалаў, літ. асацыяцыі, класічная форма. Перакладаў на літ. мову творы Я.Купалы, рус., ант. і сучасных замежных аўтараў. На бел. мову яго асобныя вершы пераклаў А.Лойка. Дзярж. прэмія Літвы 1972.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Літоўская савецкая паэзія: Анталогія. Мн., 1977. Т. 1; Рус. пер. — Стихи о дружбе. Вильнюс, 1984.

ХУРМА́ (Diospyros), род кветкавых раслін сям. эбенавых. Каля 500 відаў. Пашыраны ў трапічных (пераважна даждавых лясах Малайскага архіпелага) і субтрапічных паясах, некат. дасягаюць Японіі і Паўн. Амерыкі. На Каўказе 1 рэліктавы від — Х. звычайная, або каўказская (D.lotus). Вырошчваюць 2 віды Х.: усходнюю (D.kaki), стараж. культура Японіі і Кітая, у Расіі з канца 19 ст., і вірджынскую (D.virginiana).

Вечназялёныя або лістападныя дрэвы і кусты. Лісце суцэльнае. Кветкі раздзельнаполыя, дробныя, у невял. пазушных пучках або адзіночныя. Плод — ягада, дыям. да 10 см, у некат. відаў ядомая. Свежыя плады Х. ўсходняй маюць да 25% монацукрыдаў, сушаныя — да 62%, жалеза, вітамін С, не маюць кіслот. Многія трапічныя віды даюць чорную драўніну — эбенавае дрэва, з якога выраблянюць мэблю, муз. інструменты, дробныя вырабы. Харч., тэхн., лек., дэкар. расліны.

Хурма: 1 — каўказская; 2 — вірджынская; 3 — усходняя (кветкі, плады, насенне).

ХУРС Іван Кузьміч (н. 29.9.1922, в. Клятное Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.), военачальнік, віцэ-адмірал (1982). Скончыў Севастопальскае ваенна-марское вучылішча (1942), акадэмію Генштаба (1952) і Вышэйшую ваенна-марскую (1954). У Вял. Айч. вайну з 1941 на Чарнаморскім флоце і Волжскай ваен. флатыліі. Удзельнік абароны Севастопаля, Каўказа, Сталінградскай бітвы 1942—43, вайны з Японіяй 1945. Пасля вайны да 1987 на Ціхаакіянскім флоце: камандзір міннага тральшчыка, штурман — нач. штаба дывізіёна тральшчыкаў, потым на адказных пасадах у Гал. штабе ВМФ. Дзярж. прэмія СССР 1980.

Б.Дз.Далгатовіч.

ХУРСЕ́ВІЧ Галіна Кузьмінічна (н. 10.2.1941, г. Петразаводск, Карэлія, Расія), бел. вучоны ў галіне палеанталогіі. Д-р біял. н. (1992). Скончыла БДУ (1963). З 1972 у Ін-це геал. навук Нац. АН Беларусі (у 1993—97 заг. лабараторыі). Навук. працы па стратыграфіі неагенавых і антрапагенавых адкладаў палеагеаграфіі позняга кайназою на Беларусі; марфалогіі, сістэматыцы, эвалюцыі і філагеніі прэснаводных цэнтрычных дыятомавых водарасцей і інш.

Тв.: История развития диатомовой флоры озер Нарочанского бассейна. Мн., 1976; Ископаемая диатомовая флора Белоруссии. Мн., 1980 (разам з Л.П.Логінавай); Атлас видов Stephanodiscus и Cyclostephanos (Bacillariophyta) из верхнекайнозойских отложений СССР. Мн., 1989.

ХУ́РСІК Сымон Аляксеевіч (13.2.1902, в. Снусцік Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. — 31.3.1972), бел. пісьменнік. Скончыў БДУ (1930). У 1925—27 настаўнічаў, працаваў у газ. «Чырвоная Полаччына». У 1931 рэпрэсіраваны, настаўнічаў у Марыйскай і Чуваш. АССР, Казахстане. У 1958 рэабілітаваны. З 1964 жыў у г. Караганда. Друкаваўся з 1924. Аўтар зб-каў апавяд. «Першы паўстанак» (1925), «Шляхамі навальніц» (1930), аповесці «Чорны мост» (1929—30), прысвечаных жыццю бел. вёскі ў паслярэв. гады. Пісаў вершы. На бел. мову пераклаў аповесць А.Серафімовіча «Горад у стэпе» (1930) і інш.

С.А.Хурсік.

ХУРЫ́ТЫ, старажытныя плямёны, паводле мовы роднасныя урартам. Вядомы з 3-га тыс. да н.э. ў Паўн. Месапатаміі і на левых прытоках р. Тыгр, у 2-м тыс. да н.э. таксама ў верхнім і сярэднім цячэнні р. Еўфрат, у Сірыі, у гарах Таўра, месцамі ў Палесціне і інш. Х. звязваюць з *кура-аракскай культурай*. Лічаць, што цэнтрам іх распаўсюджання было Закаўказзе. У Сірыі і Месапатаміі жылі ўперамежку з *семітамі*. У 16—13 ст. да н.э. яны заснавалі ў Паўн.-Зах. Месапатаміі дзяржаву *Мітані* і паўплывалі на *Хецкае царства*. У 1-м тыс. да н.э. жылі разарванымі арэаламі па зах., паўн. і ўсх. ускраінах Армянскага нагор'я. Матэрыялы для вывучэння іх мовы: надпіс хурыцкай жрыцы Цішары з Уркіша (3-е тыс. да н.э.), рэліг. тэксты з *Мары* і *Вавілоніі*, акадска-хурыцкія білінгвы (двухмоўныя тэксты) і фрагменты шумерска-хурыцкага слоўніка з *Угарыта*, рэліг.-літаратурныя тэксты з Хатусаса (гл. *Багазкёй*; 2-е тыс. да н.э.) і інш. У сваёй пісьменнасці карысталіся рознымі відамі клінапісу.

ХУСЕ́ЙН (студз. 626, г. Медына, Саудаўская Аравія — 10.10.680), трэці шыіцкі *імам*. Другі сын *Алі ібн Абі Таліба*, унук *Мухамеда*. Пасля смерці ў 680 халіфа *Муавіі I* з намерам захапіць уладу ў халіфаце з невял. атрадам накіраваўся з Меккі ў Куфу (рэзідэнцыя намесніка халіфа). Акружаны каля мяст. Кербела войскамі пераемніка Муавіі I халіфа Язіда I, адмовіўся здацца і быў забіты. Шыіты лічаць Х. велікамучанікам і шануюць як 3-га (пасля Алі ібн Абі Таліба і яго старэйшага сына Хасана) імама. Памяці яго гібелі прысвечаны жалобны звычай шахсей-вахсей; г. Кербела (Ірак), дзе пахаваны Х., месца паломніцтва шыітаў.

ХУСЕ́ЙН БЕН ТАЛА́Л, Хусейн ібн Талал, Хусейн I (14.11.1935, г. Аман, Іарданія — 7.2.1999), кароль Іарданіі [1953—99]. З дынастыі *Хашымітаў*. Скончыў Каралеўскую ваен. акадэмію ў Сандхёрсце (Вялікабрытанія). Са жн. 1952 в. а. караля (бацька быў псіхічна хворы), з мая 1953 кароль. Адыгрываў важную ролю ва ўрэгуляванні *Блізкаўсходняга канфлікту* і ў блізкаўсх. палітыцы ў цэлым. У 1970—71 выдаліў з Іарданіі атрады *Арганізацыі вызвалення Палесціны*. Удзельнік падпісання мірных пагадненняў паміж Іарданіяй і Ізраілем (1994). *В.У.Адзярыха.*

ХУСЕ́ЙН аль-Тыкрыці Садам (н. 28.4.1937, г. Тыкрыт, Ірак), дзяржаўны дзеяч Ірака. Ген. (1976), маршал (1979). Скончыў ун-т аль-Мустансірыя (Багдад). З 1956 у *Партыі арабскага сацыялістычнага адраджэння* (Баас), чл. (з 1963), нам. старшыні (з 1969), старшыня (з 1979) яе Рэгіянальнага камандавання ў Іраку. Пасля няўдалага замаху ў 1959 на прэзідэнта А.*Касема* эмігрыраваў. Пасля прыходу Баас да ўлады (лют. 1963) вярнуўся ў Ірак, калі ўлада Баас была скінута (ліст. 1963), зняволены ў турму. Удзельнік дзярж. перавароту (ліп. 1968), які зноў прывёў да ўлады Баас і яе лідэра А.Х. аль-Бакра (дзядзьку Х.). З ліст. 1969 віцэ-прэзідэнт Ірака і нам. старшыні Савета рэв. камандавання (СРК). У 1979 адхіліў аль-Бакра ад улады і сам стаў прэзідэнтам Ірака і старшынёй СРК. Вёў *ірана-іракскую вайну 1980—88*, у жн. 1990 здзейсніў агрэсію супраць Кувейта, што прывяло да *Кувейцкага крызісу 1990—91* і міжнар. санкцый супраць Ірака. Улада Х. ў Іраку скінута ў выніку ўмяшання амер.-брыт. войск (сак.—крас. 2003), яго далейшы лёс невядомы. *В.У.Адзярыха.*

ХУ́СТКА, хуста, жаночы галаўны ўбор; квадратны кавалак тканіны або ажурнага палатна без тканай асновы. На Беларусі Х. насілі асобна або з чапцом, тканкай, каптуром (на Усх. Палессі насілі звычайна 2 Х.). Х., складзеную трохвугольнікам, завязвалі пад падбародкам ці ззаду, а таксама насілі ў выглядзе буслянкі (абвівала галаву і завязвалася спераду або падтыкалася па баках). Яе шырока выкарыстоўвалі ў вясельных, радзінных і пахавальных абрадах. На Палессі, Панямонні, Цэнтр. Беларусі ў канцы 19 — пач. 20 ст. замяніла *намітку*.

Рабілі Х. з ільняной, ваўнянай, баваўнянай даматканкі або вязалі на прутках. Суцэльнакроеныя і сшыўныя Х. аздаблялі ўзорыстым натыканнем, вышыўкай, набойкай, карункамі, нашыўкамі, махрамі. Зімовыя Х. (апінка, ахілянка, круцьвенька, канаплянка) вял. памераў, іх ткалі або вязалі з белай, карычневай, чорнай воўны. Тканіну ці ажурнае палатно часта прывальвалі і аздаблялі па ўсіх 4 баках ці адным рагу махрамі, кутасамі, карункамі, абапал краёў натыкалі каляровыя шлякі. Насілі паверх больш лёгкіх Х. або накідвалі на плечы. Летнія Х. белыя, натуральнага колеру лёну ці воўны, іх аздаблялі па краях махрамі. Высокага майстэрства ў стварэнні Х. для летняга святочнага ўбору дасягнулі нар. майстры Падняпроўя і Усх. Палесся. Х. *турава-мазырскага строю* шылі з белага паркалю, аздаблялі вышыўкай гладдзю ці крыжыкам; іх сакавіты, рознакаляровы арнамент з ліся, сцяблінак, кветак вызначаўся адметнай графікай малюнка (кампанаваўся пышным букетам па цэнтры ці адным рагу). Х. *магілёўскага строю* аздаблялі вышыўкай на ўсіх рагах чырвоным або чырвона-чорным геам. арнаментам. Х. *пінска-івацэвіцкага строю* вылучаліся тонкасцю палатна, вытанчаным узорам букетаў ці вянкоў на адным з рагоў. Для строяў Падзвіння характэрна аздабленне блакітным набіваным арнаментам, на Панямонні Х. выраблялі з вязанага ажурнага палатна чорнага, карычневага, шэрага, белага, чырвонага колеру. У канцы 19 — 20 ст вял. пашырэнне мелі шаўковыя, кашміравыя, паркалёвыя Х. фабр. вытв-сці (маліноўкі, кашміроўкі, канаплянкі, дубальтоўкі і інш.).

Літ.: Раманюк М.Ф. Беларускае народнае адзенне: [Альбом]. Мн., 1981.

М.Ф.Раманюк.

ХУСТЫСІЯЛІ́ЗМ (ад ісп. Justicia справядлівасць), дактрына стварэння справядлівай «надкласавай» дзяржавы ў Аргенціне, абвешчаная ў 1946—47 Х.Д.*Перонам*. Спалучала ідэі *нацыяналізму*, высокай сац. абароненасці працоўных пры захаванні і развіцці рыначнай эканомікі. Яе практычнае ажыццяўленне Перонам (нацыяналізацыя шэрагу галін прам-сці, стварэнне сістэмы сац. гарантый, заахвочванне афіц. прафсаюзаў і інш.) спынена эканам. дэпрэсіяй (з 1949). Х. у аснове ідэалогіі Хустысіялісцкай партыі, пазіцыі якой асабліва моцныя ў рабочым руху Аргенціны.

ХУ́ТАР, аднадворнае сельскае паселішча. У адрозненне ад адрубной гаспадаркі (гл. *Водруб*) пры хутарской на адасобленым участку зямлі размяшчаюцца ўся сядзіба і інвентар, неабходны для яе апрацоўкі. Х. вядомы з найстараж. часоў у многіх земляробчых народаў Еўропы і некат. народаў Сярэдняй Азіі. У Зах. Еўропе (Англія, шэраг раёнаў Германіі) узнік у 16 ст. На зах. тэр. Беларусі хутарская гаспадарка пачала складвацца ў 16 ст. ў выніку правядзення *валочнай памеры*. У 18—19 ст. хутка стала пашырацца ў скандынаўскіх краінах і Нідэрландах. У Расіі хутарская гаспадарка з'явілася ў 1-й пал. 18 ст. на тэр. Войска Данскога. У некат. краінах (ЗША і інш.) яе пашырэнне звязана з каланізацыяй новых тэрыторый (тэрмін «хутарская гаспадарка» атаясамліваецца з паняццем «фермерская гаспадарка»). На

Беларусі ў 19 ст. Х. найчасцей называлі *фальваркі*, што належалі шляхціцам-арандатарам, *аднадворцам* і *чыншавым сялянам*. Хутарская форма вядзення *сельскай гаспадаркі* ў найб. ступені стымулявалася развіццём капіталіст. адносін, інтэнсіфікацыяй гаспадаркі. Сялянскія Х. на Беларусі з'явіліся ў 2-й пал. 19 ст. з развіццём *капіталізму*. Першапачаткова на Х. і водрубы выходзілі пераважна гаспадары, якія датэрмінова выкупілі свае *надзелы*. Пад уплывам перасяленцаў з Прыбалтыкі хутарское рассяленне ў бел. губернях пашырылася на мяжы 19—20 ст. Напр., у Віцебскай губ. ў 1905 налічвалася больш за 5 тыс. Х. Хутарская гаспадарка была сімвалам заможнасці, што стымулявала выхад на Х. У гады *сталыпінскай аграрнай рэформы* ініцыятыву часткі сялян падтрымлівала дзяржава і рассяленне на Х. набыло сілу імклівага руху. Істотныя абмежаванні ўчастковага *землекарыстання* ў перыяд *«ваеннага камунізму»* не спынілі распаўсюджання хутарскіх гаспадарак. На 1.1.1925 каля 25% сял. гаспадарак размяшчаліся на Х. і водрубах. У якасці альтэрнатыўных форм Х. выступалі *калгасы* і *саўгасы*. У 1926 з усіх хутарскіх гаспадарак Беларусі 25,6% былі створаны да Кастр. рэвалюцыі 1917, астатнія пасля: 23,2% — на падворна-цераспалосных землях у ходзе землеўпарадкавання, больш за 50% — на б. памешчыцкіх землях, атрыманых сялянамі пасля 1917. Распаўсюджанай з'явай была арганізацыя малазямельнымі сялянамі на землях дзярж. маёмасці калектыўных гаспадарак з наступным імкненнем рассяліцца на Х. Каб спыніць распад калгасаў, Прэзідыум ЦВК БССР прыняў у лют. 1928 спец. пастанову, якая забараняла размеркаванне калгаснай зямлі. У 1929 хутарская форма наогул забаронена. На тэр. Зах. Беларусі ў 1923—29 хутарызацыя была адным з асн. кірункаў агр. палітыкі польскіх улад. У выніку працэнт Х. тут дасягаў 43% гаспадарак і 60% сял. зямлі. Працэсы *калектывізацыі* бел. *вёскі* заканамерна выклікалі ссяленне з Х. У адпаведнасці з пастановай ЦК ВКП(б) і СНК СССР ад 27.5.1939 «Аб мерах па ахове грамадскіх земляў калгасаў ад разбазарвання» ўсе хутарскія гаспадаркі да вер. 1940 падлягалі ссяленню на *пасёлкі*. У зах. абласцях Беларусі гэты працэс прыпаў на 1950-я г.

Літ.: Макараў М.П. Спроба вывучэння эфектыўнасці форм землекарыстання ў БССР. Мн., 1929; Данилов В.П. Советская доколхозная деревня: население, землепользование, хозяйство. М., 1977; Ягож. Советская доколхозная деревня: социальная структура, социальные отношения. М., 1979; Хромчанка Дз.М. Формы землекарыстання ў беларускай вёсцы ў 1920—1927 гг. // Весці АН Беларусі. Сер. грамад. навук. 1991. №1; Зялінскі П.І. Аграрная рэформа ў Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.) // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: Гісторыя і сучаснасць. Мн., 2000. *С.М.Ходзін.*

ХУ́ТАР, вёска ў Чэрвеньскім р-не Мінскай вобл., каля аўтадарогі Мінск—Беразіно. Цэнтр сельсавета і унітарнага с.-г. прадпрыемства. За 22 км на ПнУ ад г. Чэрвень, 84 км ад Мінска, 25 км ад чыг. ст. Градзянка. 424 ж., 168 двароў (2003). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў.

ХУТКАДЗЕ́ЯННЕ ЭВМ, паказчык, які характарызуе хуткасць работы ЭВМ ці яе прадукцыйнасць. Вызначаецца часам выканання 1 арыфм. аперацыі, а таксама сярэднестат. колькасцю аперацый, выкананых ЭВМ за адзінку часу. Залежыць ад архітэктуры ЭВМ, яе элементнай базы, скорасцю абмену са знешнімі накапляльнікамі і інш.

ХУТКАРЭ́ЗНАЯ СТАЛЬ, высокалегіраваная *інструментальная сталь*. Мае 5,5—19% вальфраму, дабаўкі хрому, ванадыю, малібдэну і інш. Адрозніваецца высокай чырванастойкасцю (550—600 °С). Выкарыстоўваецца для вырабу металарэзных інструментаў, якія працуюць на скарасцях, у 3—5 разоў большых, чым інструменты з вугляродзістай інстр. сталі.

ХУ́ТКАЯ МЕДЫЦЫ́НСКАЯ ДАПАМО́ГА, лячэбна-прафілактычная ўстанова для аказання экстраннай кругласутачнай мед. дапамогі насельніцтву. Станцыі Х.м.д. ствараюцца ў гарадах з нас. больш за 50 тыс. як самаст. мед. ўстановы або ўваходзяць у склад гар. бальніц на правах іх структурных падраздзяленняў. У буйных гарадах у склад станцый Х.м. д. ўваходзяць падстанцыі. Асн. функцыян. адзінка — выязная брыгада (фельчарская, урачэбная, інтэнсіўнай тэрапіі і інш.). У гарадах з нас. больш за 100 тыс. вылучаюцца спецыялізаваныя брыгады (напр., кардыялагічныя, рэанімацыйныя). Аказваюць мед. дапамогу пры няшчасных выпадках (траўмы, ра-

1

2

3

4

Хусткі: 1 — хустка-абхінанка (вёска Панямоніцы Лідскага раёна Гродзенскай вобл.; сярэдзіна 20 ст.), 2 — у тэхніцы ўзорыстага натыкання (вёска Неглюбка Веткаўскага раёна Гомельскай вобл.; 1930-я гады), 3 — хустка паверх чапца (вёска Опаль Іванаўскага раёна Брэсцкай вобл.; сярэдзіна 20 ст.), 4 — з вышыўкай крыжыкам (вёска Кашэвічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобл.; 1930-я гады).

ненні, апёкі), атручэннях, родах, востpых расстройствах сардэчна-сасудзістай сістэмы, дыхання, стрававання і інш. Яна не лечыць хворых сістэматычна, не выдае лісткоў непрацаздольнасці. Першая на Беларусі станцыя Х.м.д. ў Мінску створана ў 1922. У 2002 служба Х.м.д. Беларусі налічвала 197 станцый, 7 аддзяленняў экстранай і кансультатыўнай дапамогі, 1564 урачэбныя брыгады (у т.л. 490 спецыялізаваныя), 1988 фельчарскія брыгады. Штогод аказвае экстранную мед. дапамогу 4 млн. грамадзян. *Э.А.Вальчук.*

ХУ́ТКІЯ НЕЙТРО́НЫ, нейтроны з энергіяй, умоўна большай за 100 кэВ. Няпругка рассейваюцца на атамных ядрах і выклікаюць эндатэрмічныя ядз. рэакцыі. Выкарыстоўваюцца для вывучэння размеркавання энергіі ўзбуджэння паміж нуклонамі, якія ўваходзяць у састаў атамнага ядра. Гл. таксама *Нейтронная фізіка.*

ХУТЫ́НСКІ СЛУЖЭ́БНІК, рукапісны помнік 12—13 ст. Мяркуюць, што паходзіць з Полацкіх зямель. Належаў Варлааму, заснавальніку Наўгародскага Хутынскага манастыра (адсюль назва). Напісаны ўставам на пергаменце на 30 аркушах на стараслав. мове, уключае літургіі і малітвы. Аздоблены 2 мініяцюрамі з выявамі Васіля Вялікага і Іаана Златавуста, 3 застаўкамі і ініцыяламі з рысамі візант. стылю ў спалучэнні з раннімі матывамі тэраталагічнага стылю: манументальныя, сухаватыя спакойныя постаці святых змешчаны ў арнаментаваных рамках, выкананых сіняй і чырв. фарбамі; застаўкі ў выглядзе прамавугольных рамак, у якіх выявы пакручастых лістоў, крутні з візант. кветкамі «крынамі». Ініцыялы выкананы кінавар'ю і золатам. У 16 ст. контуры малюнкаў падноўлены залатой падводкай. Зберагаецца ў Гіст. музеі ў Маскве.

Літ.: Протасьева Т.Н. Византийский орнамент // Древнерусское искусство: Рукописная книга. М., 1974. Сб. 2; Попова О.С. Русская книжная миниатюра XI—XV вв. // Там жа. М., 1983. Сб. 3; Шматаў В.Ф. Беларуская кніжная гравюра XVI—XVIII стст. Мн., 1984. *В.Д.Сінякевіч.*

ХУФУ́Ф Эль-Хуфуф, горад на ПнУ Саудаўскай Аравіі. 101 тыс. ж. (1976). Трансп. вузел. Прам-сць: цэментавая, апрацоўка фінікаў; саматужная вытв-сць шарсцяных тканін, плашчоў, сярэбраных і залатых вырабаў і інш. На З ад Х. — буйное нафтавае радовішча Гавар (больш за палавіну нафтаздабычы краіны).

ХУХ-ХО́ТА, Гуйсуй, горад на Пн Кітая. Адм. цэнтр аўт. р-на Унутраная Манголія. 652 тыс. ж. (1990). Гандл.-трансп. вузел. Буйны культ. і навук. цэнтр. Прам-сць: чорная металургія, машынабудаванне, хім., перапрацоўка с.-г. прадукцыі (гарбарныя, шарсцяныя, мясаперапр., цукровыя, мукамольныя прадпрыемствы). Саматужныя промыслы. Ун-т.

ХУ ЦЗІНЬТА́О (н. 25.12.1942, пав. Цзісі, прав. Аньхой, Кітай), дзяржаўны і паліт. дзеяч Кітая. Скончыў Пекінскі політэхн. ун-т Цынхуа (1965) і займаўся ў ім н.-д. працай. У час *«культурнай рэвалюцыі»* сасланы (1968) на «перавыхаванне працай» чорнарабочым у прав. Ганьсу. З 1969 на тэхн., парт. і грамадскай (з моладдзю) рабоце ў буд-ве. З 1982 старшыня Усекіт. саюза моладзі, з 1984 1-ы сакратар сакратарыята яго ЦК. З 1985 сакратар к-таў Камуніст. партыі Кітая (КПК) прав. Ганьсу і Тыбецкага аўт. раёна (1988—92). З 1992 чл. Пастаяннага к-та Палітбюро ЦК КПК і Сакратарыята ЦК КПК. Адначасова дырэктар Партшколы ЦК КПК, нам. старшыні Кіт. Нар. Рэспублікі, з 1999 1-ы нам. старшыні Цэнтр. ваен. савета КНР. Ген. сакратар ЦК КПК з ліст. 2002. Старшыня КНР з сак. 2003.

ХУ́ЦКІ Генадзь Іванавіч (7.9.1928, г. Быхаў Магілёўскай вобл. — 7.11.2002), бел. вучоны ў галіне аўтаматычнага кіравання. Д-р тэхн. н. (1970), праф. (1977). Скончыў Маскоўскі энергет. ін-т (1950). У 1956—64 і з 1980 у Бел. нац. тэхн. ун-це (у 1980—96 заг. кафедры, у 1983—89 дэкан ф-та); у 1964—80 у НДІ г. Мінска. Навук. працы па праблемах аўтаматызацыі тэхнал. працэсаў у энергетыцы і прыладабудаванні, па распрацоўцы праграмнага забеспячэння для робататэхн. сістэм і выкарыстанні іх у прыладабуд. прам-сці.

Тв.: Приспосабливающиеся системы автоматического управления для тепловых электрических станций. Мн., 1968; Промышленные роботы в действии. Мн., 1986 (у сааўт.). *А.І.Болсун.*

ХУЦЫ́ЕЎ Марлен Мартынавіч (н. 4.10.1925, Тбілісі), расійскі кінарэжысёр. Нар. арт. Расіі (1977). Нар. арт. СССР (1986). Скончыў Усесаюзны ін-т кінематаграфіі (1952), з 1978 выкладае ў гэтым ін-це. З 1944 у кіно (памочнік мастака). Як кінарэжысёр дэбютаваў у 1950 («Горадабудаўнікі»). Яго фільмам уласціва спалучэнне дакумент. дакладнасці і глыбокага ўнутр. драматызму з тонкім лірызмам, паэт. вобразнасцю, метафарычнасцю: «Вясна на Зарэчнай вуліцы» (1956, з Ф.К.Міронерам), «Два Фёдары» (1959), «Мне дваццаць гадоў» (1965), «Ліпеньскі дождж» (1967), «Быў месяц май» (тэлефільм, 1970), «Пасляслоўе» (1983), «Бясконцасць» (1992). Стварыў дакумент. фільмы «Чырвоны ветразь Парыжа» (1971), «Людзі 1941 года» (2002). Піша сцэнарыі. Дзярж. прэмія Расіі 1993.

Літ.: Зоркая Н. Марлен Хуциев // Зоркая Н. Портреты. М., 1965.

ХУ ЯБА́Н (ліст. 1915, г. Люян, Кітай — 15.4.1989), кітайскі паліт. і дзярж. дзеяч. Удзельнік Вял. пахода Чырв. Арміі Кітая 1934—36, у вайну з Японіяй 1937—45 паліт. камісар у 2-й палявой арміі. У 1952—66 1-ы сакратар Камуніст. саюза моладзі Кітая. У час *«культурнай рэвалюцыі»* 1966—76 двойчы рэпрэсіраваны і двойчы рэабілітаваны (канчаткова ў 1977). Ген. сакратар (лют. 1980 — студз. 1987) і старшыня (чэрв. 1981 — вер. 1982, пасада скасавана) ЦК КПК. Праводзіў больш прагматычную за папярэднікаў эканам. палітыку, прасоўваў маладыя кадры кіраўнікоў, прытрымліваўся прынцыпу калект. кіраўніцтва. За «паліт. памылкі» вызвалены ад пасады ген. сакратара, але пакінуты чл. Пастаяннага к-та Палітбюро ЦК КПК.

Ю.В.Бажэнаў.

ХЫНА́М, горад у КНДР, на Японскім моры. Адміністрацыйна ў саставе г. *Хамхын.* 260 тыс. ж. (1976). Порт у заліве Хамхынман (Усх.-Карэйскі зал. Жоўтага м.). Прам-сць: хім. (цэнтр вытв-сці мінер. угнаенняў), каляровая металургія (выплаўка алюмінію), цяжкае машынабудаванне, харчовая. Суднаверф. Рыбалоўства.

ХЭБЭ́Й, правінцыя ў Паўн. Кітаі. Абмываецца залівамі Ляадунскім і Бохайвань Жоўтага мора. Пл. 190 тыс. км^2. Нас. 66,99 млн. чал. (2001). Адм. ц. — г. *Шыцзячжуан.* Большасць тэр. на Вял. Кітайскай раўніне, на З — горы Тайханшань, на Пн і ПнЗ — Яньшань, Ляасі. Клімат умераны, мусонны. Гал. рэкі Луаньхэ, Хайхэ. Х. — важны індустр. раён Кітая. Здабыча каменнага вугалю, жал. руды, нафты, каляровых металаў. Агульнанац. значэнне мае чорная металургія, машынабудаванне (энергет., гарнаруднае, трансп., металургічнае, нафтавае абсталяванне, с.-г. машыны), тэкст., фарфора-фаянсавая прам-сць. Вытв-сць электраэнергіі на ЦЭС і ГЭС. Найб. прамысл. цэнтры: Таншань, Шыцзячжуан, Ханьдань, Чжанцзякоў, Баадзін, марскі порт Цыньхуандао. У сельскай гаспадарцы пераважае земляробства, часткова арашальнае. Вырошчваюць пшаніцу, кукурузу, гаалян, проса, рыс, сою, арахіс, кунжут, кенаф, бавоўнік, тытунь. Агародніцтва. Садоўніцтва. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, аслоў, авечак, свіней, птушак. Рыбалоўства.

ХЭГА́Н, горад на ПнУ Кітая, у прав. Хэйлунцзян. 522 тыс. ж. (1990). Цэнтр здабычы каменнага вугалю. Прам-сць: буд. матэрыялаў, дрэваапр., харчовая.

ХЭЙЛУНЦЗЯ́Н, правінцыя на ПнУ Кітая, у басейне р. Амур (кіт. Хэйлунцзян). Мяжуе на Пн і У з Рас. Федэрацыяй. Пл. 469 тыс. км^2. Нас. 38,11 млн. чал. (2001). Адм. ц. — г. *Харбін.* Большасць тэр. на раўнінах Сунляо і Саньцзянская, на ПнЗ горы Вял. Хінган, на ПнУ — Малы Хінган, на ПдУ — Усх.-Маньчжурскія горы. Клімат кантынентальны. Гал. рэкі — Амур, Сунгары. У сельскай гаспадарцы пераважае земляробства. Х. — буйная харч. база краіны; займае вядучае месца па зборы цукр. буракоў, соі, лёну-даўгунцу, сланечніку; вырошчваюць пшаніцу, куку-

рузу, гаалян, бульбу, ячмень, авёс. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней, птушак. Здабыча нафты (радовішча *Дацын*), вугалю, каруючых сланцаў, жал. руды і каляровых металаў. Прам-сць: машынабудаванне (абсталяванне для электраэнергетыкі, металургіі, лакаматывы, с.-г. машыны, судны, станкі, электратэхніка), чорная металургія, лясная, дрэваапр. і цэлюлозна-папяровая, хім., харч., тэкст., у т.л. льняная; вытв-сць буд. матэрыялаў. Асн. прамысл. цэнтры: Харбін, Цыцыкар, Муданьцзян, Хэган, Цзямусы. Суднаходства па рэках Амур, Сунгары, Усуры.

ХЭЛМ, Холм (Chełm), горад на У Польшчы. Вядомы з 11 ст. 69,9 тыс. ж. (1997). Чыг. вузел. Прам-сць: цэм., шкляная, абутковая, харчовая, Арх. помнікі 17—18 ст.

ХЭ́ЛМСКАЕ ВАЯВО́ДСТВА (Województwo Chełmskie), былая адм.-тэр. адзінка на У Польшчы. З 1999 у складзе *Люблінскага ваяводства*.

ХЭ́ЛСЕЛ (Halsell) Джэймс (н. 29.9.1956, Уэст-Манро, ЗША), касманаўт ЗША. Магістр у галіне кіравання і аэранаўтыкі. Скончыў Акадэмію ВПС ЗША (1978), ун-т Троя (1983), Тэхнал. ін-т ВПС ЗША (1985). З 1990 у групе касманаўтаў НАСА. Здзейсніў 5 палётаў у складзе экіпажаў касм. караблёў (КК): 8—23.7.1994, 4—8.4.1997, 1—17.7.1997 — на КК «Калумбія», 12—20.11.1995 — на КК «Атлантыс» (як пілот) і арбітальнай станцыі «*Мір*», 18—29.5.2000 — на КК «Атлантыс» (як камандзір) па праграме работ з Міжнар. касм. станцыяй. У космасе правёў 52,4 сут. 5 медалёў НАСА «За касмічны палёт». *У.С.Ларыёнаў.*

ХЭНА́НЬ, правінцыя ў Кітаі, у бас. сярэдняга і ніжняга цячэння рэк Хуанхэ і Хуайхэ. Пл. 167 тыс. км^2. Нас. 95,55 млн. чал. (2001). Адм. ц. — г. *Чжэнчжоў*. Усх. ч. правінцыі ў межах Вял. Кітайскай раўніны, на З адгор'і гор Цыньлін і Тайханшань. Клімат субтрапічны, мусонны. Гал. рэкі Хуанхэ і Хуайхэ з прытокамі. Х. — адзін з важных земляробчых раёнаў краіны (пшаніца, бавоўнік, гаалян, бабовыя, рыс, караняплоды, арахіс, тытунь, кунжут, чай. Садоўніцтва. Свінагадоўля. Здабыча каменнага вугалю і жал. руды. Прам-сць: лёгкая (пераважна баваўняная), харч. (мукамольная, алейная), чорная металургія, машынабудаванне (трактары, абсталяванне для горнай і хім. прам-сці, станкі, падшыпнікі), хім., папяровая, цэментавая. Асн. прамысл. цэнтры: Чжэнчжоў, Пінды́ншань, Кайфын, Лаян, Аньян, Сіньсян, Сіньян.

ХЭНТЭ́Й, Хентэй, нагор'е ў паўн.-ўсх. частцы Манголіі (паўн. адгор'і ў Расіі). Даўж. каля 250 км. Выш. да 2800 м. Складзена пераважна з граніта́ў. Характэрны згладжаныя або столападобныя вяршыні са слядамі зледзянення́ў. На паўд. схілах горныя стэпы, на паўн. — лесастэпы, участкі тайгі (лістоўніца, кедр). Запаведнік Богда-Ула. Радовішчы бурага вугалю, залатаносныя россыпы.

ХЭН'Я́Н, горад у цэнтр. ч. Кітая, у прав. Хунань. 487 тыс. ж. (1990). Порт на р. Сянцзян. Чыг. вузел. Цэнтр здабычы поліметал. руд. Прам-сць: вытв-сць гарнаруднага абсталявання і с.-г. машын.



Д.Х.**Х'юбел**.

Э.**Х'юіш**.

ХЭСІ́ КАЛІДО́Р, Ганьсуйскі калідор, ланцуг упадзін паміж пустыняй Гобі і паўн. падножжам Наньшаня, у Кітаі. Даўж. каля 1000 км, шыр. 20—100 км, выш. 800—1500 м. Сістэма грабенаў з высокім паўд. і нізкім паўн. схіламі. Каля падножжа гор складзены з галечнікаў. У паніжэннях на З — саланчакі, участкі пяскоў. Гал. рэкі Сулэхэ і Хэйхэ (Жашуй). Пустынная і паўпустынная расліннасць. Аазіснае земляробства (збожжавыя, бавоўнік). Здабыча нафты. Х.к. — гал. шлях, які злучае ўсх. і паўн.-зах. раёны Кітая (чыгунка, шаша).

ХЭФЭ́Й, горад на У Кітая. Адм. цэнтр прав. Аньхой. 733 тыс. ж. (1990). Трансп. вузел. Прам-сць: металургічная, маш.-буд., тэкст., хім., харчовая. Ун-т.

Х'Ю́БЕЛ (Hubel) Дэвід Хантэр (н. 27.2.1926, г. Уінсар, Канада), амерыканскі ўрач-нейрафізіёлаг. Чл. Нац. АН ЗША, Амер. акадэміі мастацтваў і навук. Скончыў ун-т Макгіла (1947, г. Манрэаль) і мед. школу пры ім (1951). З 1951 у ЗША. З 1958 ва ун-це Дж. Хопкінса, з 1959 у Гарвардскай мед. школе г. Бостан (з 1967 праф.). Навук. працы па нейрафізіялогіі зроку. Адкрыў прынцыпы перапрацоўкі інфармацыі ў нейронных структурах мозга, што ўспрымаюць вонкавыя сігналы. Нобелеўская прэмія 1981 (з Р.У.*Сперы*, Т.Н.*Візелам*). *В.Ф.Ермакоў.*

Х'Ю́ІШ (Hewish) Энтані (н. 11.5.1924, г. Фой, Вялікабрытанія), англійскі радыёастраном. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1968), шэрагу АН. Д-р філасофіі (1952). Скончыў Кембрыджскі ун-т (1948), дзе выкладаў з 1961 (з 1971 праф.). З 1946 у Малардаўскай радыёастр. абсерваторыі (Кембрыдж, у 1982—88 дырэктар). У 1976—81 праф. Каралеўскага ін-та Вялікабрытаніі. Навук. працы па радыёастраноміі. Прадказаў (1954) і адкрыў (1964) эфект мігацення дыскрэтных радыёкрыніц у міжпланетнай прасторы і вызначыў іх характарыстыкі. Адкрыў пульсары (1967, з Дж.Бел Барнел) і даказаў, што яны знаходзяцца ў межах Галактыкі. Выказаў гіпотэзу, што пульсары з'яўляюцца нейтроннымі зоркамі (1968). Нобелеўская прэмія 1974 (з М.*Райлам*).

Тв.: Рус. пер. — Пульсары // Земля и Вселенная. 1971. №2; Пульсары и физика высоких плотностей // Успехи физ. наук. 1975. Т. 117, вып. 2. *М.М.Касцюковіч.*

Х'ЮМ (Hume) Джон (н. 18.1.1937, г. Лондандэры, Паўн. Ірландыя), грамадскі і паліт. дзеяч Паўн. Ірландыі ў складзе Вялікабрытаніі. Настаўнічаў, з 1960-х г. актывіст руху за правы католікаў Паўн. Ірландыі. З 1979 старшыня С.-д. лейбарысцкай партыі Паўн. Ірландыі, з 1983 дэп. ад яе ў брыт. парламенце. Выступае за мірныя сродкі вырашэння канфлікту паміж католікамі і пратэстантамі Паўн. Ірландыі, быў пасрэднікам на перагаворах паміж брыт. ўладамі, пратэстанцкімі лідэрамі і кіраўнікамі Ірл. рэсп. арміі, якая вяла ўзбр. барацьбу супраць брыт. праўлення. У крас. 1998 падпісаў пагадненне з лідэрам паўн.-ірл. пратэстантаў У.Д.*Трымблам* аб мірным урэгуляванні канфлікту. Нобелеўская прэмія міру 1998 (з Трымблам). *В.У.Адзярыха.*

Х'Ю́РАН, другая назва воз. *Гурон*.

Х'Ю́СТАН (Houston), горад на Пд ЗША, у штаце Тэхас. Засн. ў 1836. 1,8 млн. ж. (1998, з г. Бейтаўн і прыгарадамі 3,9 млн. ж.). Найбуйн. нафтавы і

Горад **Х'юстан**. Цэнтр касмічных даследаванняў.

збожжавы порт ЗША. Суднаходным марскім каналам звязаны з Мексіканскім зал. і аванпортам Галвестан. Трансп. вузел. Міжнар. аэрапорт. Вузел нафтаправодаў. Здабыча і перапрацоўка нафты, газу, серы, солі. Прам-сць: нафтахім. і хім. (найбуйн. ў краіне цэнтр па вытв-сці сінт. каўчуку, пластмас, хімікатаў, мінер. угнаенняў); чорная металургія; вытв-сць машын, абсталявання, прылад і труб для нафтагазавай прам-сці; радыёэлектронная, суднабуд., харч., паліграф., рысаачышчальная. Цэнтр пілатуемых касм. палётаў НАСА. Ун-ты, музеі, тэатры.

Х'ЮСТАНСКІ СУДНАХО́ДНЫ КАНА́Л, каналізаваны водны шлях на Пд ЗША, ад Мексіканскага заліва да г. Х'юстан. Даўж. 80 км, глыб. 12 м. Адкрыты ў 1915.

Горад Хюэ. Старажытныя гарматы каля ўвахода ў былы каралеўскі палац.

ХЮЭ́, Г у э (Huê), горад у цэнтр. ч. В'етнама, паблізу вусця р. Хюэ. Адм. ц. правінцыі Біньчытх'ен. Засн. пад назвай Нятнам у 3 ст. да н.э. 211 тыс. ж. (1990). Буйны трансп. вузел. Прам-сць: рысаачышчальная, лесапільная, тэкст., харч.; вытв-сць буд. матэрыялаў. Ун-т.

У 19 ст. сталіца В'етнама, у 1884—1945 рэзідэнцыя анамскіх імператараў. Помнікі сярэдневяковай архітэктуры, многія з якіх разбураны ў час *в'етнамскай вайны 1964—73*, уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.

Літ.: Х о а н г Х о а. Этот прекрасный город Хюэ // Вьетнам. 1980. №8.

Ц

Ц, дваццаць пятая літара бел. алфавіта. Паходзіць з кірыліцкай Ц («цы»), якая была графічнай дыферэнцыяцыяй стараж.-яўр. ⵚ («цадэ»). У старабел. графіцы ў сувязі з функцыянаваннем розных пісьмовых школ і выкарыстаннем розных тыпаў пісьма (*устаў, паўустаў, скорапіс*) ужывалася ў некалькіх варыянтах, якія памагаюць вызначаць час і месца напісання помнікаў. Абазначала гук «ц» («царь», «цукоръ»). Мела лічбавае значэнне «дзевяцьсот». У 16 ст., акрамя рукапіснай, набыла друкаваную форму. У сучаснай бел. мове абазначае шумныя глухія злітныя пярэднеязычныя зычныя гукі «ц», «ц'» («цана», «цішыня» — «ц'ішын'а»). Бывае вялікая і малая, мае рукапісную і друкаваную форму.

А.М.Булыка.

ЦА́ВА (Tsavo), нацыянальны парк на ПдУ Кеніі, у бас. р. Аці і Цава. Засн. ў 1948. Пл. 2,08 млн. га (1978). Паўпустыннае плато (600—2600 м над узр. м.). Усх. ч. — паркавая саванна, дзе пераважаюць баабабы, малачаі і акацыі, зах. ч. мае вулканічны ландшафт. У фауне слон, насарогі, гіпапатамы, буйвалы, антылопы, зебры, газелі, леапард, гепард, леў, плямістая гіена, земляны воўк, бабуіны і інш. Больш за 450 відаў птушак: цацаркі, франкліны, бліскучыя шпакі, грыфы і інш. Турызм.

ЦАГАРА́ЕЎ Максім Мікалаевіч (5.5.1916, г. Алагір, Паўн. Асеція — 2.12.1990), асецінскі пісьменнік, грамадскі дзеяч. Нар. пісьменнік Паўн. Асеціі (1986). Засл. дз. маст. Паўн. Асеціі (1986). Скончыў Паўн.-Асецінскі пед. ін-т (1940). У 1958—60 міністр культуры Паўн. Асеціі, у 1960—63 рэдактар час. «Мах дуг» («Наша эпоха»). Аўтар кн. ваен. нарысаў «На захадзе» (1947), зб. вершаў «Сляды чалавека» (1973), рамана «Сляпы дождж» (1983), аповесцей «На дарозе шчасця» (1947), «Пастух чорнай гары» (1961), «Паходная песня» (1965), «Калі прачынаюцца камяні» (1970), «Наследніца» (1979) і інш.

Тв.: Рус. пер. — Осетинская быль. М., 1975.

Літ.: Марзоев М. М.Цагараев. Орджоникидзе, 1960.

А.С.Пухаеў.

ЦАГАРЭ́ЛІ Аўксенцій Антонавіч (21.2.1857, с. Дыгомі, Грузія — 25.8.1902), грузінскі драматург. Вучыўся ў духоўнай семінарыі. У 1878—83 акцёр, потым служыў на Закаўказскай чыгунцы (да 1899). У апошнія гады жыцця рэжысёр Тбіліскага нар. т-ра. Аўтар быт. камедый, у якіх выявіў сябе як майстар вострага дыялога і камічных сітуацый: «Іншыя зараз часы» (паст. 1879, экранізавана ў 1965), «Ханума» (паст. 1882, экранізавана ў 1927), «Цымбірэлі» (1886), «З чым прыйдзеш, з тым пойдзеш» (паст. 1902) і інш. На сюжэты яго п'ес створаны опера «Кето і Катэ» В.Далідзе (1919) і аднайм. фільм (1948) і інш.

ЦАГЕ́ЛЬСКІ Уладзімір Іосіфавіч (н. 20.8.1934, в. Мятлічыцы Лагойскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне інфарматыкі; адзін з першых сістэмных праграмістаў Беларусі. Канд. фіз.-матэм. н. (1976), дац. (1983). Скончыў БДУ (1958). З 1958 у НДІ ЭВМ (з 1974 нач. аддзела). Навук. працы па выліч. тэхніцы, праграмным забеспячэнні, алгарытмічных мовах і сістэмах праграмавання. Распрацаваў праграмныя сродкі тэсціравання ЭВМ, сістэмы праграмавання для ЭВМ сям'і «Мінск», Адзінай сістэмы і персанальных; транслятары і іх мадыфікацыі.

Тв.: Диалоговая система программирования ДИСП. М., 1981 (у сааўт.); Персональные ЭВМ Единой системы: Бейсик. М., 1988 (разам з М.А.Кучурам, М.В.Ходашам).

М.П.Савік.

ЦАДАСА́ Гамзат (2.9.1877, с. Цада, Дагестан — 11.6.1951), аварскі паэт. Нар. паэт Дагестана (1934). Бацька Р.Г.*Гамзатава*. Вучыўся ў медрэсэ. Паэт. дзейнасць пачаў у 1891. Першы зб. «Мятла адатаў» (1934). Творчасць цесна звязана з аварскім фальклорам. Аўтар аўтабіягр. паэмы «Маё жыццё» (канец 1930-х г.), паэмы «Сказанне пра чабана» (1951), зб-каў «За Радзіму!» (1942), «Да помсты!» (1944), «Выбранае» (1950), драм і камедый, першых аварскіх баек, таксама вершаў і казак для дзяцей. На бел. мову яго асобныя творы пераклалі Э.Валасевіч, М.Мятліцкі, Ю.Свірка. Дзярж. прэмія СССР 1951.

Тв.: Рус. пер. — Уроки жизни. М., 1968; Избранное. М., 1973.

Літ.: Гамзатов Г.Г. Г.Цадаса. Махачкала, 1973; Корабельников Г.М. Г. Цадаса. М., 1976.

ЦА́ДКІН (Zadkine) Восіп (14.7.1890, г. Смаленск, Расія — 25.11.1967), скульптар; прадстаўнік т.зв. *парыжскай школы*. Вучыўся ў Школе прыгожых мастацтваў у Парыжы (1909). З канца 1910-х г. працаваў пад уплывам *кубізму* («Жанчына з веерам», 1920; «Менады», 1934), пазней стаў адным з найбуйнейшых прадстаўнікоў *экспрэсіянізму* ў еўрап. скульптуры. Аўтар манумента «Зруйнаваны горад» у г. Ротэрдам (Нідэрланды, 1953), помніка В. ван Гогу ў Авер-сюр-Уаз каля Парыжа (1956).

В.Цадкін. Жанчына з веерам. 1920.

ЦАДРО́ЎСКІ Ян (3.3.1617, в. Пагост Салігорскага р-на Мінскай вобл. — 29.1.1688), грамадскі дзеяч ВКЛ, пісьменнік-мемуарыст. Вучыўся ў Крулявецкім (г. Кёнігсберг, з 1631) і Ягелонскім (г. Кракаў, з 1636) ун-тах. У 1637—69 на службе ў кн. Б.Радзівіла, суправаджаў яго ў падарожжы за мяжой. З 1643 радзівілаўскі ўраднік у Старой Вёсцы на Падляшшы. Удзельнік вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67, у 1656 пасол ад мінскай шляхты да цара Аляксея Міхайлавіча. Выбіраўся паслом на соймы, дэпутатам Трыбунала ВКЛ. Пісаў на польскай мове. Аўтар мемуараў (без назвы) пра падзеі 1617—82 у 2 частках: 1-я (скончана ў 1672) змяшчае сціслыя звесткі пра грамадска-паліт. дзейнасць аўтара, падзеі часоў вайны з Расіяй; 2-я (скончана ў 1682) складаецца пераважна з запісаў пра смерць сваякоў і знаёмых Ц., у ёй апісана расправа католікаў над віленскімі кальвіністамі ў 1682. Мемуары апубл. ў 1855 у час. «Временник императорского Московского общества истории и древностей российских» (кн. 23).

Тв.: Бел. пер. — Успаміны // Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст. Мн., 1983. *В.С.Пазднякоў.*

ЦАЙДА́МСКАЯ КАТЛАВІ́НА, Цайдам, тэктанічная міжгорная ўпадзіна ў Цэнтр. Азіі, у Кітаі. Акаймавана гарамі Наньшань, Куньлунь, Алтынтаг. Размешчана на выш. 2600—2900 м. Даўж. каля 700 км, шыр. да 300 км. Пясчана-гліністая раўніна з асобнымі ўваламі, участкамі *бедленда*, формамі эолавага выветрывання. Паўд.-ўсх. ч. катлавіны аддзелена ад паўн.-зах. уступам выш. 100 м, мае больш нізкі рэльеф, коркавыя саланчакі (пл. да 1600 км^2), што ўзніклі на месцы стараж. азёр. Клімат рэзка кантынентальны. Сярэднія т-ры студз. да -15 °С, ліп. да 18 °С. Ападкаў 25—50 мм за год, на У да 150 мм. Зіма бясснежная. Паўн.-зах. ч. практычна бязводная, на ПдУ у паніжэннях саланчакоў азёры (напаўняюцца вадой у час летняй паводкі). Горныя пустыні і стэпы.

ЦАКО́НІ (Zacconi) Эрметэ (14.9.1857, г. Мантэк'ё, Італія — 14.10.1948), італьянскі акцёр, прадстаўнік натуралістычнага кірунку ў т-ры. З 1873 выступаў у вандроўных трупах, у т.л. ў трупе Э.*Дузе*. Шмат гастраліраваў. У сваёй творчасці імкнуўся да паглыбленай трактоўкі вобразаў, падкрэсліваў псіхічныя і фіз. пакуты герояў. Сярод роляў: Мікіта («Улада цемры» Л.Талстога), Кузаўкін («Нахлебнік» І.Тургенева), граф ды Ракамонтэ («Веер» К.Гальдоні), Сакрат («Пахвала Сакрату» Платона), Гамлет, Макбет (аднайм. п'есы У.Шэкспіра), Освальд («Здані» Г.Ібсена). З 1912 здымаўся ў кіно.

ЦАЛІКО́ЎСКАЯ Людміла Васілеўна (8.9.1919, г. Астрахань, Расія — 4.7.1992), расійская актрыса. Нар. арт. Расіі (1963). З 1937 вучылася ў студыі Т-ра імя Я.Вахтангава, з 1942 у трупе гэтага т-ра (Масква). Яе мастацтву ўласцівы музыкальнасць, выразная пластыка, абаяльнасць, душэўная тонкасць, мяккі гумар. Іграла тонкапсіхал. і вострахарактарныя ролі: Беатрычэ і Джульета («Многа шуму з нічога» і «Рамэо і Джульета» У.Шэкспіра), Інкен Петэрс («Перад захадам сонца» Г.Гаўптмана), Аглая («Ідыёт» паводле Ф.Дастаеўскага), Мядынская («Фама Гардзееў» паводле М.Горкага), Эліза («Саламяны капялюшык» Э.Лабіша) і інш. З 1939 здымалася ў кіно: «Антон Іванавіч сярдуе» (1941), «Сэрцы чатырох», «Блізняты», «Іван Грозны» (усе 1945), «Скакуха» (1955), «Лес» (1980, вып. 1987) і інш.

Літ.: Вострышев М. Чарующая Целиковская. М., 2000.

ЦАЛІНА́, зямельныя ўгоддзі, прыдатныя да с.-г. выкарыстання, якія ніколі не засяваліся ці доўгі час (стагоддзі) не апрацоўваліся (гл. *Аблога*), пакрытыя прыроднай расліннасцю. У параўнанні са стараворнымі землямі глебы Ц. маюць павялічаную колькасць гумусу, азоту і інш. элементаў жыўлення раслін, яны больш структурныя і ўшчыльненыя, менш засмечаны насеннем пустазелля, маюць зніжаную біял. актыўнасць і своеасаблівы водны рэжым (у засушлівых раёнах мацней высушаныя, у вільготных — больш увільготненыя).

ЦАЛІНАГРА́Д, назва г. Астана ў Казахстане ў 1961—92 (у 1992—98 наз. *Акмала*).

ЦА́ЛЯ, адзінка даўжыні ў брытанскай сістэме мер, роўная 1/12 *фута* (25,4 мм). Абазначаецца ″. У ВКЛ карысталіся Ц., роўнай 2,7 см. У Расіі выкарыстоўваліся пад назвай дзюйм (ад галанд. duim, літар. — вялікі палец) да ўвядзення метрычнай сістэмы побач з *аршынам* і футам.

ЦА́МБЛАК Грыгорый [свецкае імя Гаўрыіл; каля 1364, г. Вяліка-Тырнава, Балгарыя — 1419(20?], царкоўны дзеяч, балгарскі і стараж.-рус. пісьменнік. Пісаў на царк.-слав. мове. Царк. адукацыю атрымаў у Афоне (Грэцыя). З 1393 на царк.-адм. пасадах у Канстанцінопалі, Малдове, Сербіі. З 1415 мітрапаліт кіеўскі і ў ВКЛ. Каля 1416 перанёс цэнтр мітраполіі з Кіева ў Вільню, рэзідэнцыю ў г. Навагрудак. Прадстаўнік Тырнаўскай літ. школы. Аўтар больш як 40 твораў (збераглося больш за 20), пераважна панегірычна-дыдактычных «слоў», напісаных у стылі «пляценне славес»: «Пахвальнае слова Яўфімію Тырнаўскаму» (1416—17), «Надмагільнае слова святому Дзмітрыю», «Як трымаюць веру немцы» і інш. Творы Ц. напісаны вобразнай мовай, багатыя метафарамі, параўнаннямі, антытэзамі, складанымі фігурамі; бытавалі ў шматлікіх рукапісных зб-ках. З бібліятэк Супрасля, Жыровіч, Вільні захавалася больш за 200 зб-каў з яго творамі, шэраг з іх бел. паходжання. Творчая спадчына Ц. паўплывала на развіццё бел. аратарскай прозы, садзейнічала ўмацаванню культ. сувязей усх. і паўд. славян, пашырэнню паўд.-слав. літ. уплываў на Русі.

Тв.: Похвално слово за Евтимий... София, 1971; Житие на Стефан Дечански... София, 1983.

Літ.: Яцимирский А. Григорий Цамблак. СПб., 1904; Мечев К. Григорий Цамблак. София, 1969; Лапіцкі М. Праваслаўе ў Вялікім княстве Літоўскім з часоў панаваньня Уладыслава Ягайлы. Нью-Йорк, 1978. *В.А.Чамярыцкі.*

ЦАМЯ́НКА, будаўнічы, звычайна вапнавы раствор з дамешкай дробнатоўчанай чырвонай цэглы для муроўкі і тынкоўкі сцен, іх грунтоўкі пад фрэскавы жывапіс. Такі раствор выкарыстоўвалі фінікійцы (10 ст. да н.э.) для гідраізаляцыі вадасховішчаў і водаправодаў; Ц. пашырана ў буд-ве Стараж. Грэцыі і Рыма, у манум. буд-ве Візантыі. На Беларусі ўжывалася з 11—12 ст. у муроўках: мяшанай, са «схаваным радам», дэкар. мяшанай, раўнарадавай (Полацк, Віцебск, Тураў, Навагрудак, Гродна). У выніку чаргавання бледна-ружовых палос Ц. і чырвонай *плінфы* паверхня сцяны мела дэкар. выгляд (Сафійскі сабор і Спаса-Праабражэнская царква Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра ў Полацку). Ц. ўжывалася часам у буд-ве канца 16 — пач. 17 ст. (палац у Старым замку ў Гродне). *А.А.Трусаў, М.М.Цэйтліна.*

ЦАНА́, грашовае выяўленне кошту адзінкі тавару (прадукцыі вырабаў, паслуг і інш.). Узровень Ц. вызначае рэнтабельнасць прадпрыемства, яго жыццяздольнасць і фін. стабільнасць. Фарміруецца ў залежнасці ад сумы выдаткаў вытв-сці і сярэдняга прыбытку на авансаваны капітал, попыту і прапановы, магчымасцей рынку, яго тыпу, ёмістасці і інш. фактараў.

У практыцы цэнаўтварэння вылучаюць наст. мэты фарміравання Ц.: арыентацыя на збыт, калі вытворца (прадавец) зацікаўлены ў максімізацыі долі тавару на рынку, росце аб'ёмаў продажу; арыентацыя на атрыманне максімальнага прыбытку; арыентацыя на існуючае становішча, калі вытворца імкнецца пазбегнуць неспрыяльных уздзеянняў знешняга асяроддзя (канкурэнцыя, падаткаабкладанне і інш.). Асн. віды Ц.: адпускныя, закупачныя, *рознічныя цэны*. Ц. можа быць свабодная (фарміруецца прадпрыемствам ці інш. суб'ектам гаспадарання, зыходзячы з выдаткаў вытв-сці, попыту і прапановы, памеру аптовай і гандл. надбаўкі, умоў пастаўкі, плацяжоў, кан'юнктуры рынку, сезоннага попыту і інш. фактараў), фіксаваная (рэгулюецца органамі цэнаўтварэння), дагаворная (кантрактная, устанаўліваецца ў дагаворы паміж пакупніком і прадаўцом). Адрозніваюць таксама Ц.: прэйскурантныя (устанаўліваюцца органамі цэнаўтварэння ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй і ўключаюцца ў спец. зборнікі-прэйскуранты), намінальныя (Ц. тавару, пазначаныя ў прэйскуранце або на тавары), пакупніка або прадаўца (фактычныя грашовыя сумы куплі ці продажу тавару на рынку), зменныя (устанаўліваюцца ў залежнасці

ад суадносін попыту і прапановы і паступова паніжаюцца, калі рынак насычаецца такім таварам), *даўгачасныя* (слаба схільныя да змен на працягу доўгага часу), *эластычныя* (хутка рэагуюць на змены суадносін попыту і прапановы) і інш.

У.Г.Залатагораў.

ЦАНА́ ДЭ́МПІНГАВАЯ, цана, свядома заніжаная адным або некалькімі суб'ектамі *цэнаўтварэння* ў параўнанні з яе рыначным узроўнем; звычайна ніжэй за *выдаткі вытворчасці*. Выкарыстоўваецца як сродак выцяснення канкурэнтаў з рынку павелічэння аб'ёмаў продажу. У многіх краінах такія цэны кантралююцца дзяржавай і абкладаюцца высокімі антыдэмпінгавымі падаткамі і пошлінамі. Гл. таксама *Дэмпінг*.

ЦАНА́ ЗЯМЛІ́, паказчык, які характарызуе кошт зямельнага ўчастка ў залежнасці ад яго якасці, месцазнаходжання, рыначных і інш. умоў. У сусв. практыцы вылучаюць 3 асн. падыходы да ацэнкі зямлі: прыбытковы, параўнальны і выдатковы. *Прыбытковы падыход* уключае спосабы, якія дазваляюць атрымаць Ц.з., зыходзячы з патэнцыяльных (мяркуемых) прыбыткаў пакупніка і выкарыстоўваецца для ацэнкі ўчасткаў, якія прыносяць прыбытак. У залежнасці ад мэтавага прызначэння ўчастка ў якасці прыбытку могуць разглядацца: *рэнта* (для ацэнкі с.-г. і лясных зямель); арэндная плата (для ацэнкі зямель паселішчаў); частка прыбытку ад маёмаснага комплексу, што прыпадае на забудаваны ўчастак; прыбытак ад прыросту кошту ўчастка, які будзе атрыманы ў будучым пры яго продажы або закладзе пад іпатэчны крэдыт. У краінах з развітым зямельным рынкам і ўстойлівай эканам. сістэмай часцей выкарыстоўваецца *параўнальны падыход*, заснаваны на сістэматызацыі і складанні рыначнай інфармацыі пра цэны аналагаў. Калі прыбытковы падыход арыентаваны на прагнозы адносна будучых прыбыткаў, то параўнальны грунтуецца на інфармацыі аб яго прыбытках у мінулыя часы. Параўнальны падыход можа даць нездавальняючыя вынікі ва ўмовах высокіх тэмпаў *інфляцыі*, пры нястачы або нізкай дакладнасці рыначнай інфармацыі пра параўнальныя аб'екты, пры рэзкіх зменах рыначных умоў. У аснове *выдатковага падыходу* — нарматыўныя разлікі на стварэнне аналагічнага па якасці ўчастка, ацэнка выдаткаў на яго асваенне і аднаўленне інфраструктуры. Такі падыход дазваляе вызначыць рыначны кошт зямельнага ўчастка. Пры разліках неабходна ўлічваць часовыя фактары, ўзровень інфляцыі, прывесці ў параўнальны выгляд кошт усіх выдаткаў на час ацэнкі. Пры ацэнцы кошту зямлі выкарыстоўваюць усе падыходы; перавага аддаецца абагульненаму падыходу, заснаванаму на больш поўнай і дакладнай інфармацыі.

Літ.: Мелкумов Я.С. Организация и финансирование инвестиций. М., 2000; Федотова М.А., Уткин Э.А. Оценка недвижимости и бизнеса. М., 2000.

У.Р.Залатагораў.

ЦАНА́ ПО́ПЫТУ, рыначная цана пры такім стане *попыту* і *прапановы*, калі прыярытэтнае становішча на рынку займаюць пакупнікі прадукцыі, а не яе прадаўцы; фактычная грашовая сума куплі тавару, па якой ажыццяўляецца здзелка *куплі-продажу*, ва ўмовах перавышэння прапановы над попытам; цана, па якой пакупнік гатовы набыць тавар. Характарызуецца тэндэнцыяй цэн да паніжэння.

У.Р.Залатагораў.

ЦАНА́ ПРАПАНО́ВЫ, рыначная цана пры такім стане попыту і прапановы, калі прыярытэтнае становішча на рынку займаюць вытворцы і прадаўцы прадукцыі; фактычная грашовая сума ад рэалізацыі тавару на рынку ва ўмовах перавышэння попыту над прапановай; цана, па якой прадавец гатовы прадаць тавар. Характарызуецца дыктатам вытворцы (прадаўца) і адсутнасцю канкурэнцыі (манапалістамі з'яўляюцца прадаўцы, вытворцы, пастаўшчыкі), калі пакупнік вымушаны набываць амаль усё, што пастаўляецца на рынак, па павышаных цэнах.

У.Р.Залатагораў.

ЦАНА́ РЭАЛІЗА́ЦЫІ, цана, па якой прадаецца тавар. Устанаўліваецца паводле зыходнай цаны і карэкціруецца ў залежнасці ад шэрагу фактараў. Магчымы розныя варыянты аплаты за перавозку тавараў ад вытворцы да спажыўца (франкіраванне цэн, гл. *Франка*); можа мяняцца ў сувязі з устанаўленнем занальных цэн (дыферэнцыраваных па зонах), розных скідак, надбавак і да т.п. Пасля адпаведнай карэкціроўкі фарміруецца канчатковая або Ц.р., якую да лібералізацыі цэн наз. *аптовай цаной прадпрыемства*. Калі да яе дадаюць выдаткі і прыбытак забеспячэнска-збытавых арг-цый, яна становіцца *аптовай цаной пасрэдніка*. Уключэнне выдаткаў і прыбыткаў арг-цый рознічнага гандлю фарміруе *рознічную цану*. Від Ц.р. — *закупачная цана*, якая ўстанаўліваецца на закупку с.-г. прадукцыі ў яе вытворцаў. Закупачныя і рознічныя цэны могуць мяняцца ў залежнасці ад сезона (садавіна і агародніна, адзенне, абутак і да т.п.) і Ц.р., якая ўстанаўліваецца ў гасп. дагаворах, дагаворах пастаўкі, куплі-продажу і інш., з'яўляецца дагаворнай; яна карэкціруецца ўстаноўленымі надбаўкамі або скідкамі за якасць, тэрміновасць выканання, трансп. і інш. Ц.р. залежыць таксама ад падатку на *дабаўленую вартасць*, ліцэнзійнага збору, акцызаў і інш.

У.Р.Залатагораў.

ЦАНА́ВА Лаўрэнцій Фаміч (сапр. Джанджагава; 23.8.1900, с. Нахунава Мартвілскага р-на, Грузія — 12.10.1955), адзін з кіраўнікоў органаў унутр. спраў і дзяржбяспекі БССР і СССР. Ген.-лейтэнант. Удзельнік рэв. і партыз. руху за ўстанаўленне сав. улады ў Грузіі. З 1921 у органах дзяржбяспекі. З 1938 нарком унутр. спраў, дзяржбяспекі Беларусі, з 1941 нач. асобых аддзелаў Зах. і Цэнтр. франтоў, нам. камандуючага 2-м Бел. франтам. У 1943—51 нарком (з 1946 міністр) дзяржбяспекі Беларусі. У 1951—52 нам. міністра дзяржбяспекі СССР. Чл. Цэнтр. рэвіз. камісіі ВКП(б). Чл. Бюро ЦК КП(б)Б у 1939—51. Дэп. Вярх. Савета СССР у 1937—50, Вярх. Савета БССР у 1938—51. Дзярж. прэмія СССР 1949. Ц. — адзін з арганізатараў масавых *рэпрэсій палітычных* у СССР і БССР у канцы 1930—40-х і пач. 1950-х г. Арыштаваны 4.4.1953. Памёр у Бутырскай турме ў Маскве (па інш. версіі скончыў самагубствам).

Тв.: Всенародная партизанская война в Белоруссии против фашистских захватчиков. Т. 1—2. Мн., 1951.

ЦАНГПО́, тыбецкая назва верхняга цячэння р. *Брахмапутра* ў Кітаі.

ЦАНГПО́, Вялікі каньён Цангпо, каньён у Кітаі, каля паўд.-ўсх. падножжа Гімалаяў. Размешчаны паміж гарамі Намча-Барва (выш. 7782 м) і Галунла (выш. 7234 м), на лукавіне р. Цангпо. Даўж. 496,3 км, глыб. да 5382 м (адзін з найглыбейшых у свеце). Даследаваны ў 1994.

Ф.А.Цандэр.

ЦА́НДЭР Фрыдрых Артуравіч (23.8.1887, Рыга — 28.3.1933), савецкі вучоны і вынаходнік; адзін з заснавальнікаў тэарэт. і прыкладной касманаўтыкі. Скончыў Рыжскі політэхн. ін-т (1914). З 1919 на авіяц. з-дзе ў Маскве. У 1930—31 у Маскоўскім авіяц. ін-це, з 1931 у Групе вывучэння рэактыўнага руху. З 1908 займаўся праблемамі рэактыўнага руху. Навук. працы па ракета- і астрадынаміцы, руху касм. лятальных апаратаў (КЛА) у гравітацыйным полі Сонца, планет і іх спадарожнікаў, вызначэнні траекторыі і працягласці палётаў. Прапанаваў ідэю выкарыстання гравітацыйнага ці эл.-магн. поля Месяца і планет для павелічэння скорасці палёту касм. лятальнага апарата (КЛА), ідэю планіруючага спуску КЛА з тармажэннем у атмасферы планеты (1924—25), праект міжпланетнага карабля на аснове спалучэння самалёта і ракеты і спальвання ў палёце адпрацаваных метал. частак КЛА як дадатковага паліва (1924). Кіраваў стварэннем першага сав. вадкаснага

рэактыўнага рухавіка (1931—33). Імем Ц. названы кратэр на адваротным баку Месяца.

Тв.: Проблема полета при помощи реактивных аппаратов: Межпланетные полеты. 2 изд. М., 1961;

Літ.: Ф.А.Цандер и современная космонавтика. М., 1976; Салахутдинов Г.М. Ф.А. Цандер. М., 1987. *У.С.Ларыёнаў.*

ЦАНКО́ЎСКІ Леў Сямёнавіч (13.10.1822, Варшава — 7.10.1887), расійскі вучоны ў галіне батанікі, протазаалогіі і бактэрыялогіі. Чл.-кар. Пецярб. АН (1881). Скончыў Пецярб. ун-т (1844). З 1850 праф. Дзямідаўскага ліцэя (г. Ярослаўль), з 1854 — Пецярбургскага, з 1865 Новарасійскага (г. Адэса), з 1872 — Харкаўскага ун-таў. Навук. працы па вывучэнні антагенезу ніжэйшых раслін і жывёл, генет. адзінстве расл. і жывёльнага свету. Распрацаваў метад атрымання вакцыны супраць сібірскай язвы.

ЦАПЕ́НКА Маргарыта Мсціславаўна (18.6.1911, С.-Пецярбург — 17.1.1968), бел. геолаг. Д-р геолага-мінералаг. навук (1967). Скончыла Маскоўскі геолага-разведачны ін-т (1935). Заг. сектара геалогіі (з 1939), чацвярцічнай геалогіі (з 1955) Ін-та геал. навук АН Беларусі. Выкладала ў БДУ і БПІ. Даследавала геалогію мелавых, палеагенавых, неагенавых і антрапагенавых адкладаў Беларусі. Заснавальнік школы бел. геолагаў па вывучэнні антрапагену. Асн. працы па антрапагенавых утварэннях і геамарфалогіі.

Тв.: Краткий очерк геологии Белоруссии. Мн., 1957 (у сааўт.); Антропогеновые отложения Белоруссии. Мн., 1959 (разам з Н.А.Махнач); Геоморфология (разам з Л.М.Вазнячуком) // Геология СССР. Т. 3. Белорусская ССР. М., 1971.

ЦАПРА́, рака ў Нясвіжскім і Клецкім р-нах Мінскай вобл., левы прыток р. Лань (бас. р. Прыпяць). Даўж. 21 км, пл. вадазбору 123 км^2. Пачынаецца за 1 км на ПнУ ад в. Габруны Нясвіжскага р-на, вусце за 1,5 км на Пд ад в. Чырвоная Зорка Клецкага р-на. Цячэ пераважна ў межах Капыльскай грады. Асн. прыток — р. Конік (злева). Рэчышча каналізаванае. На рацэ плаціны і сажалкі каля в. Пляшэвічы Нясвіжскага р-на (пл. 21,8 га) і в. Зубкі Клецкага р-на (пл. 34 га).

ЦАР (ад лац. Caesar — тытул імператараў Стараж. Рыма), афіцыйны тытул манархаў Балгарыі (10—14 ст., 1908—46), Сербіі (1346—71) і Расіі (1547—1721). Тэрмінам Ц. таксама традыцыйна называюць манархаў Стараж. свету. Славяне з 6—7 ст. Ц. называлі імператараў Візантыі, пазней — «Свяшчэннай Рым. імперыі», ханаў *Залатой Арды*, султанаў Турцыі і інш. У Балгарыі тытул Ц. першым прыняў кн. *Сімяон* [893—927, Ц. з 919], у Сербіі — кароль Стэфан III Душан [1331—55, Ц. з 1346]. У Расіі тытул Ц. упершыню ў паліт. значэнні ўжыты сярод інш. вял. кн. маскоўскім Іванам III у 1492. Афіцыйна Ц. у якасці гал. тытула называліся рас. манархі, пачынаючы з *Івана IV* [1533—84, Ц. з 1547]. З прыняццем *Пятром I* [1682—1725] імператарскага тытула (1721) тытул Ц. працягваў неафіцыйна ўжывацца да Лют. рэвалюцыі 1917 і па сваім значэнні наблізіўся да каралеўскага ў зах.-еўрап. кантэксце.

Літ.: Успенский Б.А. Царь и император: Помазание на царство и семантика монарших титулов. М., 2000. *С.М.Салей.*

ЦАР ПРО́ЖАР, сатырычны персанаж бел. чарадзейных казак, у якім увасоблены рысы жорсткага, самаўладнага цара-дэспата. Яго вобраз намаляваны з дапамогай гіпербал і гратэскаў: ён з'ядае штодзень па 10 чал., якіх яму дастаўляе служка нягодны Сокал, а вочы яго так заплылі тлушчам, што слугі вымушаны падымаць павекі вілкамі. У казках народ даваў цару зневажальныя мянушкі: Гарох, Лукапёр, Чубара, Трасцыт і інш. З Ц.П. распраўляецца асілак Іллюшка — забівае яго сваёй 12-пудовай шапкай. Вобраз Ц.П. блізкі да быліннага персанажа Ідаліщча Паганага.

А.С.Фядосік.

ЦАРА́НЕ (ад рум. ţara зямля) у Малдаўскім княстве і Бесарабіі, 1) у 16—18 ст. адна з назваў феадальна залежных сялян (юрыд. запрыгонены ў 1646). 2) Паводле Улажэння 1749 (скасавала асабістую прыгонную залежнасць) катэгорыя асабіста свабодных сялян, але прымацаваных да сваіх вёсак, дзе яны плацілі падаткі; за карыстанне зямлёй феадалаў аддавалі ім $^1/_{10}$ атрыманых с.-г. прадуктаў і адпрацоўвалі фіксаваную паншчыну. Канчаткова вызвалены ад феад. залежнасці паводле рэформы 1864, пасля аб'яднання Малдовы і Валахіі ў адзіную дзяржаву Румынію. У анексіраванай Рас. імперыяй (1812) б. частцы Малд. княства Бесарабіі (пераважна тэр. сучаснай Малдовы) Ц. захоўвалі асабістую свабоду, ад феад. залежнасці вызвалены ў 1861—68. Пазней тэрмін «Ц.» стаў азначаць земляробаў, сялян увогуле.

ЦАРАНКО́ВА (дзявочае Сцяфанава) Людміла Пятроўна (н. 7.11.1930, г. Варонеж, Расія), бел. спявачка (лірыка-каларатурнае сапрана). Засл. арт. Беларусі (1968). Скончыла Магілёўскае муз. вучылішча (1953). У 1953—89 салістка Дзярж. акад. хар. капэлы Беларусі. Валодае прыгожым голасам чыстага тэмбру. Выканаўца нар. песень, сольных партый у хар. і кантата-аратарыяльных творах бел., рус. і зах.-еўрап. кампазітараў: «Дняпро» Я.Туранкова, «Павей, ветрык» Р.Пукста, «Мелодыя» С.Рахманінава, «Аве Марыя» А.Луцці ў апр. Э.Тырманд і інш.

«ЦАР-ГАРМА́ТА», бронзавая гладкаствольная гармата (марціра), адлітая ў 1586 майстрам ліцейнай справы А.*Чохавым* (па некат. звестках выхадзец з Беларусі). Агульная маса з лафетам 80 т, маса ствала 40 т, даўж. 5,34 м, калібр 890 мм. Прызначалася для абароны Крамля, але з яе ніколі не стралялі. Упрыгожана паясамі рэльефаў. Дэкаратыўны лафет адліты ў 1835 на Пецярбургскім ліцейным з-дзе. Помнік ліцейнага майстэрства 16 ст. Устаноўлена ў Маскоўскім Крамлі побач з «Цар-звонам».

«Цар-гармата».

ЦАРГРА́Д, старажытна-руская назва г. Канстанцінопаль (цяпер г. *Стамбул*).

ЦАР-ДУБЫ́, векавыя экземпляры дуба чарэшчатага незвычайных памераў. На Беларусі больш за 50 Ц.-д. маюць статус *помнікаў прыроды* рэсп. значэння. Большасць іх на Палессі. Найб. вядомыя дуб-патрыярх (узрост каля 700—800 гадоў, выш. 40—50 м, дыям. ствала 2—2,5 м) у Маларыцкім, дуб-Якуб у Нясвіжскім, дуб-волат у Жабінкаўскім, Суворайскі дуб у Кобрынскім р-нах і інш. Маюць навук., гіст., культ.-пазнавальнае і эстэт. значэнне.

А.А.Малажайскі.

ЦАРКАВІ́ШЧА, возера ў Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Бярозаўка, за 18 км на ПнЗ ад г. Глыбокае, каля в. Мосар. Пл. 1,61 км^2, даўж. 3,27 км, найб. шыр. 700 м, найб. глыб. 1,9 м, даўж. берагавой лініі 9 км. Пл. вадазбору 6,6 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу, выцягнута з ПнУ на ПдЗ. Схілы катлавіны выш. да 2 м (на ПдЗ і ПнУ 5—8 м), разараныя, невял. ўчасткі пад лесам і хмызняком. На У і З тэраса выш. 0,4—0,6 м. Берагі нізкія, на Пд і Пн часткова сплавінныя. Пойма забалочаная. Дно плоскае, сапрапелістае. Зарастае. Упадае больш за 10 меліярац. канаў.

ЦАРКАВІ́ШЧА, возера ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Ушача (цячэ праз возера), за 0,5 км на Пд ад в. Царкавішча, за 20 км на ПдЗ ад г.п. Уша-

чы. Пл. 0,37 км^2, даўж. 930 км, найб. шыр. 660 м, найб. глыб. 16,1 м, даўж. берагавой лініі 2,64 км. Пл. вадазбору 130 км^2. Катлавіна эварзійнага тыпу, круглаватая, злёгку выцягнутая з ПнУ на ПдЗ. Схілы катлавіны выш. 10—17 м (на ПдЗ 5—8 м, на У 3—5 м), разараныя, на У і ПдУ пад лесам. Берагі нізкія, пясчаныя, пад хмызняком. Дно да глыб. 2—2,5 м пясчанае, ніжэй ілістае. Зарастае. Упадаюць 2 ручаі і ручай з воз. Полазна.

ЦАРКВА́ (ад грэч. kyriakē дом божы), 1) арганізацыя паслядоўнікаў пэўнай *рэлігіі* (пераважна ў *хрысціянстве*) на аснове агульнага веравучэння і *культу рэлігійнага*; у хрысціянскім багаслоўі паняцце, якое абазначае містычную супольнасць вернікаў, дзе ажыццяўляецца яднанне чалавека з *Богам* праз сумесны ўдзел у *таінствах* (найперш еўхарыстыі). Універсальны «саборны» характар Ц. як містычнага «цела Хрыстова» і «паўнаты Св. Духа» (гл. *Саборнасць*) робіць немагчымым яе атаясамліванне з этн., паліт. ці інш. супольнасцю (племем, нацыяй, дзяржавай). Для Ц. характэрна існаванне сістэмы абавязковых *догматаў рэлігійных* і *абрадаў рэлігійных*. Кіраванне ёю, як правіла, заснавана на іерархічных прынцыпах. Пратэстанцкая трактоўка ў адрозненне ад правасл. і каталіцкай дагматыкі адмаўляе функцыю Ц. як пасрэдніцы паміж Богам і чалавекам, адвяргае традыц. падзел на свецкіх асоб і клір *(духавенства)* і абвяшчае догмат аб «агульным святчэнстве».

Хрысц. Ц. як сац. ін-т складалася паступова на аснове невыліках аб'яднанняў вернікаў — эклесій, у якіх яшчэ не было прафес. духавенства і развітай абраднасці. У 2—3 ст. з'явіўся клір на чале з епіскапамі. Для прыняцця агульных рашэнняў праводзіліся з'езды епіскапаў (саборы). У 1054 адбыўся падзел хрысціянскай Ц. на каталіцкую (гл. *Каталіцызм*) і праваслаўную (гл. *Праваслаўе*). У пач. 16 ст. ўзніклі пратэстанцкія секты.

У сучасным рэлігіязнаўстве акрамя Ц. і *секты* вылучаюць і дэнамінацыю — рэліг. аб'яднанне, якое знаходзіцца ў стадыі станаўлення, арганізац. афармлення. Розныя хрысц. канфесіі істотна адрозніваюцца па сваёй арганізацыі. Толькі каталіцкая Ц. і нестарыянская асірыйская Ц. Усходу (гл. *Нестарыянства*) з'яўляюцца адзінымі ў арганізац. плане; у праваслаўі і *монафізіцтве* існуе значная колькасць самаст. памесных Ц. *Пратэстантызм* не ўяўляе сабой адзінага цэлага і з'яўляецца вял. колькасцю плыней (*англіканская царква, лютэранства, кальвінізм*, арг-цыі *баптыстаў*, метадыстаў, *пяцідзесятнікаў* і інш.), якія ў сваю чаргу падзяляюцца на асобныя Ц. і дэнамінацыі. Гісторыю розных Ц. на Беларусі гл. ў арт. *Праваслаўная царква, Рымска-каталіцкая царква, Беларуская грэка-каталіцкая царква.*

2) Назва *храма* ў праваслаўі, уніяцтве і некат. інш. рэлігіях. Развіццё асн. тыпаў Ц. звязана з познавізант. крыжова-купальнымі храмамі, у розных краінах вызначалася мясцовымі гіст., культ., маст. асаблівасцямі, уплывам раманскай і гатычнай архітэктуры. Паводле аб'ёмна-планіровачнай структуры вылучаюць тыпы Ц. — *крыжова-купальны храм*, *базіліка* і восевая, паводле канстр. схемы — 4-, 6-стаўповыя, бесстаўповыя і інш. Звычайна Ц. мае 3-часткавую кампазіцыю: прытвор, асн. аб'ём і *алтар*.



Царква Раства Хрыстова ў г. Тоцьма Валагодскай вобл. (Расія). 18 ст.

Пры ўзнікненні *трапезнай* Ц. набыла 4-часткавую структуру. Над прытворам часта ўзвышаецца *званіца* — вышынная дамінанта кампазіцыі будынка (можа стаяць і асобна). Над скрыжаваннем цэнтр. *нефа* і *трансепта* ўзводзяць свет-



Царква ў гонар Мінскага абраза Маці Божай у Мінску. 1994—99. Архітэктар А.Трухін.

лавы *барабан*, які завяршаецца купалам і апіраецца на слупы пры дапамозе ветразевых скляпенняў. Кожны неф заканчваўся *апсідай* (паўкруглай, 3-граннай і інш.). У бакавых апсідах, калі яны злучаліся з асноўнай, дзе быў гал. алтар, рабілі спец. памяшканні — дзяканнік, ахвярнік.

Арыгінальныя тыпы Ц. сфарміраваліся на тэр. Стараж. Русі. Найб. пашыраны будынкі квадратныя ці прамавугольныя ў плане, з 4 або 6 нефамі, 3 апсідамі і адным купалам. У 15—16 ст. будавалі 5-купальныя Ц. Яны вылучаліся багаццем дэкар. элементаў. З 17 ст. ў драўляным дойлідстве з'явіліся Ц. 8-граннага плана, з шатровым ці купальным завяршэннем, ставіліся Ц. падоўжна-восевай кампазіцыі, 3-купальныя, з 3-схільным дахам (Расія, Беларусь, Прыкарпацце, Польшча). З 16 ст. значны элемент інтэр'ера — *іканастас*. Гал. Ц. горада ці манастыра наз. *саборам*.

На Беларусі першыя Ц. пачалі ўзводзіць з прыняццем хрысціянства *(Полацкі Сафійскі сабор)*. У 11—12 ст. склаліся своеасаблівыя школы дойлідства *(Полацкая школа дойлідства, Гродзенская школа дойлідства)*, якія творча развівалі традыцыі візант.-кіеўскага царк. буд-ва. У 15—16 ст. атрымалі развіццё Ц. абарончага тыпу *(Мураванкаўская царква-крэпасць, Сынковіцкая царква-крэпасць)*, архітэктура якіх спалучала традыцыі мясц. дойлідства і кампазіцыйна-канстр. прыёмы готыкі. Ц. 17 ст. адметныя своеасаблівым сінтэзам традыц. прыёмаў з найб. выразнымі арх. сродкамі барока (Святадухаўская царква *Аршанскага Куцеінскага Богаяўленскага манастыра*). Многія Ц. 16—17 ст. формамі і вырашэннем інтэр'ераў набліжаліся да касцёлаў (*Мінская Петрапаўлаўская царква*, царква *Беразвецкага кляштара базыльян*). У 17—18 ст. існавала *Магілёўская школа дойлідства (Магілёўскай Мікалаеўскай царквы комплекс)*. З канца 18 ст. пашырылася буд-ва на аснове прынцыпаў класіцызму (*Слаўгарадская царква Раства Багародзіцы, Чачэрская Спаса-Праабражэнская царква*, Ц. ў в. Мазалава Мсціслаўскага р-на Магілёўскай вобл.). У 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. пашыраны тыпавыя праекты з арыентацыяй на візант. і стараж.-рус. ўзоры *(Бешанковіцкая Ільінская царква)*. У драўляным дойлідстве найб. распаўсюджаны 1-, 2- ці 3-зрубныя Ц. восевай кампазіцыі *(Гомельская Ільінская царква, Давыд-Гарадоцкая Георгіеўская царква, Олтушская Спаса-Праабражэнская царква)*. Ц. крыжова-цэнтрычнай кампазіцыі адметныя дынамічнымі яруснымі завяршэннямі, выразным сілуэтам *(Веляміцкая Ільінская царква*, Віцебская Ільінская царква, *Кажан-Гарадоцкая Мікалаеўская царква)*. Архітэктура сучасных Ц. характарызуецца выкарыстаннем гіст. узораў (пераважна маскоўскіх), традыц. вырашэнняў, а таксама пошукамі новых выразных сродкаў. Прыкладам выкарыстання нац. бел. рысаў дойлідства з'яўляецца Ц. ў гонар Мінскага абраза Маці Божай у Мінску (арх. А.Трухін).

Літ.: Пучков П.И., Кузьмина О.Е. Религии современного мира. М., 1998; Самыгин С.И., Нечипуренко В.Н., Полонская И.Н. Религиоведение: социология и психология религии. Ростов н/Д, 1996; Рэлігія і царква на Беларусі: Энцыкл. давед. Мн., 2001; Чантурия В.А. История архитектуры Белоруссии. 2 изд. Мн., 1977; Сергачев С.А. Белорусское народное зодчество. Мн., 1992; Православное зодчество Беларуси. Мн., 1995.

А.У.Верашчагіна, С.А.Сергачоў (архітэктура).

ЦАРКО́ЎНА-ПАЛЕМІ́ЧНАЯ ЛІТАРАТУ́РА, рэлігійная публіцыстычная і сац.-паліт. па змесце л-ра Беларусі і Украіны канца 16 — 1-й пал. 17 ст. Уключала рукапісныя і друкаваныя адкрытыя лісты, палемічныя трактаты, памфлеты, адозвы, апалогіі і інш. Гл. ў арт. *Палемічная літаратура.*

ЦАРКОЎНАПРЫХО́ДСКІЯ ШКО́ЛЫ, адзін з тыпаў пачатковых школ у Рас. імперыі, у т.л. на Беларусі. Падпарадкоўваліся Св. Сіноду і знаходзіліся ў распараджэнні царк. прыходаў. Узніклі ў 11 ст. як царкоўныя школы, школы свяшчэннікаў. Пазней існавалі *прыходскія вучылішчы.*

Паводле «Правіл аб царкоўных прыходскіх школах» (1884) ствараліся 2 тыпы: аднакласныя (2-гадовыя) і двухкласныя (4-гадовыя). У аднакласных выкладаліся: Закон Божы, царк. спевы, чытанне, пісьмо і пач. звесткі па арыфметыцы; у двухкласных, апрача таго, кароткая царк. і рас. гісторыя, геаграфія, чарчэнне, часам маляванне. Для дзяўчынак выкладалася рукадзелле. У пач. 20 ст. тэрмін навучання ў Ц.ш. павялічыўся ў аднакласных да 3 гадоў, у двухкласных да 5. У 1911 у Літоўскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Полацкай і Мінскай епархіях існавала 75 двухкласных і 2523 аднакласныя Ц.ш., у якіх навучалася больш за 140 тыс. дзяцей. У 1-ю сусв. вайну Ц.ш. з зах. і цэнтр. Беларусі эвакуіраваны ці зачынены, на У Беларусі дзейнічалі да 1918. Частковае адраджэнне Ц.ш. пачалося ў 1990-я г. ў выглядзе нядзельных школ.

ЦАРКОЎНАСЛАВЯНІ́ЗМ, гл. *Славянізм.*

ЦАРКОЎНАСЛАВЯ́НСКАЯ МО́ВА, літаратурная мова, пашыраная ў большасці слав. народаў у 11—17 ст. Утварылася ў выніку пранікнення ў *старажытнаславянскую мову* фанет., грамат. і лексічных элементаў жывых слав. моў. Вылучаюцца звады (рэдакцыі) Ц.м.: сярэднебалг., сербскі, чэш., бел., рус. і інш. Самы багаты па колькасці помнікаў рус. звод.

На Беларусі Ц.м. выкарыстоўвалася амаль выключна ў рэліг. сферы (богаслужэнне, царк. л-ра). Сярод помнікаў бел. зводу Ц.м. — «*Жыціе Ефрасінні Полацкай*» (спіс 14 ст.), «Чэшця» (15 ст.), выданні Ф.Скарыны, б.ч. «Зборніка біблейскіх кніг № 262» (16 ст.) і інш. У іх пры захаванні архаічных рысаў стараслав. мовы адчувальны і бел. моўны ўплыў. У фанетыцы — паралельнае ўжыванне няпоўнагалосных і поўнагалосных форм («глась», «злато» — «голось», «золото»), розных рэфлексаў праслав. спалучэнняў dj, tj («надежда», «свеща» — «надежа», «свеча»), пачатковых «е» і «о» («единъ», «езеро» — «одинъ», «озеро»); у марфалогіі — выкарыстанне розных форм скланення і спражэння, напр., канчаткаў прыметнікаў роднага склону мужчынскага і ніякага роду «-аго» і «-ого» («великаго», «доброго» — «великого», «доброго»), форм на «-ши» і «-шь» у дзеясловах 2-й асобы адзіночнага ліку («будеши», «несеши» — «будешь», «несешь»); у лексіцы — ужыванне розных сродкаў для абазначэння адных і тых жа рэалій і паняццяў («блюсти», «глаголати», «житница», «персть», «страна» — «стеречи», «мовити», «гумно», «палець», «краина»).

Павышэнню аўтарытэту і нармалізацыі Ц.м. садзейнічала з'яўленне дапаможнікаў па ёй («Граматыка...» Л.Зізанія, 1596»; «Граматыка» М.Сматрыцкага, 1618, 1619; слоўнікаў «Лексіс» Зізанія, 1596; «Лексікон...» П.Бярынды, 1627; 2-е выд. 1653). На працягу многіх стагоддзяў Ц.м. ўплывала на бел. літ.-пісьмовую мову, аднак *славянізмаў* у ёй захавалася вельмі мала. Гэтым бел. мова адрозніваецца ад рус. літ. мовы, якая за час гіст. развіцця арганічна ўвабрала ў сябе цэлыя пласты слоў і фразеалагічных зваротаў стараслав. паходжання.

Літ.: Вейк Н. ван. История старославянского языка: Пер. с нем. М., 1957; Жураўскі А.І. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы. Т. 1. Мн., 1967. *А.М.Булыка.*

ЦАРКО́ЎНАЯ ВО́БЛАСЦЬ, гл. ў арт. *Папская вобласць.*

ЦАРКО́ЎНАЯ МУ́ЗЫКА, музыка, прызначаная для выканання пры набажэнстве ў храме (літургічная музыка; гл. *Літургія*), а таксама напісаная на духоўныя тэксты для канцэртнага выканання (духоўная музыка). Музыка хрысц. царквы (правасл. і каталіцкай) абапіралася на культавыя традыцыі краін Міжземнамор'я і Балканскага п-ва, складалася на тэксты біблейскіх псалмоў, гімнаў, а таксама айцоў царквы, візант., усх., балканскіх гімнографаў.

Стараж. хрысц. спеў быў аднагалосы, з мужчынскім выкананнем a cappella. Пасля *падзелу цэркваў* (1054) афіц. спевам у каталіцкай царкве стаў *грыгарыянскі харал.* У 9—13 ст. узніклі шматгалоссе (арганум, *дыскант*, гімель і інш.), новыя формы і жанры, якія дала франц. школа Нотр-Дам (такет, кандукт, клаўзула, *матэт*, рандэль). У 15—16 ст. вядучыя жанры — *меса* і матэт, з 2-й пал. 16 ст. ўзрасла роля інстр. музыкі (Дж.Палестрына). Вяршыня Ц.м. 17 ст. — творы К.*Мантэвердзі.* З 18 ст. на Ц.м. ўплываюць оперная і сімф. музыка. Сярод духоўных твораў 18—19 ст. кампазіцыі І.С.Баха, Г.Берліёза, Л.Бетховена, І.Гайдна, Г.Ф.Гендэля, В.А.Моцарта, Р.Шумана, у 20 ст. творы Б.Брытэна, З.Кодая, А.Месіяна, К.Пендарэцкага, Ф.Пуленка, І.Стравінскага, П.Хіндэміта і інш. Сучасная каталіцкая Ц.м. падзяляецца на шматгалосы спеў a cappella, шматгалоссе з інстр. суправаджэннем, нар. рэліг. спеў на лац. і нац. мовах, аўтарскую музыку, не прызначаную для культавых мэт, арганную музыку. У 15—16 ст. узнікла пратэстанцкая Ц.м. з побытавымі жанрамі (харалы, *псальмы*, *гімны*, матэты), з богаслужэннем на нар. мове, з антыфонным спевам паміж пастарам і верні камі. Рус. праваслаўная Ц.м. ўзнікла з прыняццем хрысціянства ў 10 ст.; яна пераняла ад Візантыі пеўчыя і богаслужэбныя кнігі, жанры, песнапенні, меладычныя мадэлі, сістэмы *асмагласся* і натацыі (гл. *Нотнае пісьмо*). Першапачатковыя меладыі змяняліся пад уплывам паўд.-слав. харала, быт. і нар. музыкі, перакладу на стараслав. мову і інш. Неўменная натацыя ператварылася ў старажрус. знаменную (гл. *Знаменны спеў*). Знаменныя манодыі 10—11 ст. — вак., аднагалосыя, рэчытатыўна-псалмадыйныя з абмежаванай мелізматыкай. Першыя школы царк. спеваў узніклі ў Кіеве, Полацку, Віцебску, Ноўгарадзе (з 13 ст. цэнтр царк. спеваў), Маскве (з 15 ст.). Паводле традыц. класіфікацыі вылучаюць 3 перыяды царк. спеваў: 10—14 ст. — знаменны спеў (стараж. ісцінамоўе); 15 ст. — 1668 — асобнамоўная хаманія (супадае з «эпохай лірыкі» ў нар. творчасці); з 1668 — новае ісцінамоўе. Сярод майстроў знаменнага спеву 15—17 ст.: І.Нос, Ф.Красцьянін, М.Безбароды, І.Лукошка і інш. У 17 ст. ўзніклі шматраспеўнасць, аўтарскія і лакальныя распевы, а таксама кіева-літ., балг., грэч., якія прыйшлі з Беларусі і Украіны. Значная роля ў развіцці Ц.м. хароў гасударавых і патрыяршых пеўчых дзякаў, у складзе якіх былі бел. і ўкр. спевакі. Пад уплывам кантавай культуры бел.-ўкр. традыцыі і партэснага канцэрта з 2-й пал. 17 ст. ў рус. Ц.м. склаўся *партэсны спеў.* Першы вядомы кампазітар таго часу — пеўчы дзяк В.Цітоў, у 2-й пал. 18 ст. — Дз.Бартнянскі, М.Беразоўскі. У 18 ст. Ц.м. адчула ўплывы оперных і кантавай стылістыкі. У 19 — пач. 20 ст. музыку пісалі М.Бахмецеў, Г.Ламакін, А.Львоў, П.Турчанінаў, М.Балакіраў, М.Глінка, А.Грачанінаў, М.Іпалітаў-Іванаў, А.Кастальскі, А.Лядаў, М.Рымскі-Корсакаў, П.Часнакоў і інш. Вяршыня рус. духоўнай музыкі — творы П.Чайкоўскага, С.Рахманінава. Сучасная рус. правасл. Ц.м. грунтуецца на партэсным спеве 18—19 ст.

Ц.м. Беларусі — неад'емная частка ўсёй правасл. літургічнай музыкі ўсх. славян. У 10—14 ст. у Ц.м. адбывалася прыстасаванне візант. пеўчай гімнаграфіі да мясц. умоў; з'явіліся першыя практычныя дапаможнікі па спевах («Падобнікі»); аформіўся і замацаваўся знаменны спеў; узніклі пеўчыя школы ў Полацку, Віцебску (992), Смаленску (1001), Тураве (1005). У 15—17 ст. дасягнула росквіту духоўная і пеўчая правасл. культура. Фіксаваліся аўтары песнапенняў і складальнікі рукапісных нотных зборнікаў (*ірмалогіяў*), першыя пеўчыя азбукі, тэрміналогія, зараджаліся арыгінальныя знаменны роспеў (зафіксаваны ў Супрасльскім ірмалоі 1598—1601), духоўныя канты (псальмы), першыя нотадрукі (пратэстанцкія нясвіжскія, брэсцкія, любчанскія канцыяналы). Бел. муз. гімнаграфія паступова адыходзіла ад норм асмагласся і інш. З 2-й пал. 16 ст. ў развіццё рус. правасл. царк. спеваў зроблены значны ўклад бел. «васпевакоў» І.Канюхоўскага, І.Календы, І.Дзякоўскага, А.Бераканскага, А.Мезянца (аўтара тэарэт. працы па знаменным роспеве), Б.Анісімовіча і інш. У 17—18 ст. створаны новыя рукапісныя пеўчыя зборнікі з квадратнай лінейнай і неўменнай натацыямі. У канцы 18 — 20 ст. бел. Ц.м. развівалася ў рэчышчы рас. богаслужэбнага спеву з лакальнымі асаблівасцямі. Нягледзячы на заняпад Ц.м. пасля 1917, да духоўнай музыкі звярталіся бел. кампазітары А.Тураннкоў, М.Равенскі, М.Куліковіч, з канца

1980-х г. — А.Багатыроў, А.Бандарэнка, С.Бельцюкоў, А.Залётнеў, Л.Шлег і інш.

Літ.: Розенштильд К.К. Музыкальное искусство и религия. М., 1964; Шабалин Д. Певческие азбуки древней Руси. Кемерово, 1991; Алексеева Г.В. Проблемы адаптации византийского пения на Руси. Владивосток, 1996. *Л.П.Касцюкавец.*

ЦАРКО́ЎНЫ СТАТУ́Т Рускай праваслаўнай царквы, асноўны дакумент, які вызначае парадак кіравання *Рускай праваслаўнай царквы*. Прыняты на Памесным саборы ў 1988 і замяніў «Палажэнне аб кіраванні Рускай праваслаўнай царквы» ад 1945. Складаецца з 15 раздзелаў, у якіх разглядаюцца парадак стварэння, правы і абавязкі органаў вышэйшага царк. кіравання (Памеснага і Архірэйскага сабораў, патрыярха, Св. Сінода і сінадальных устаноў), епархіяльных і прыходскіх органаў кіравання, дзейнасць манастыроў, духоўных школ, замежных царк. устаноў, пенсіённага забеспячэння духавенства, маёмасныя і фін. праблемы.

ЦАРКО́ЎНЫ ШЛЮБ, шлюб, заключаны ў царкве па рэлігійных абрадах. У дарэв. Расіі (у т.л. на Беларусі) юрыд. сілу меў толькі Ц.ш. Правасл. царкве належалі правы засведчання шлюбу, прызнанне яго законнасці і падстаў для яго скасавання. Шлюб прызнаваўся сапраўдным праз царк. заручыны і вянчанне. У прыходскіх цэрквах вяліся метрычныя кнігі, дзе рабіўся запіс аб шлюбе, што з'яўлялася доказам шлюбнага саюзу. Таксама мелі юрыд. сілу Ц.ш., заключаныя паводле абрадаў інш. прызнаных дзяржавай канфесій: каталіцызму, люцтэранства, кальвінізму, ісламу, будызму, іудаізму. Паводле заканадаўства Рэспублікі Беларусь шлюбны саюз заключаецца ў ЗАГСе. Ц.ш. разглядаецца як данін народна-рэліг. традыцыям і без рэгістрацыі яго ў адпаведных дзярж. органах не мае юрыд. сілы.

ЦАРКО́ЎНЫЯ КНЯ́ЖАЦКІЯ СТАТУ́ТЫ, царкоўныя княжацкія уставы, граматы князёў, якімі ў 10—15 ст. рэгулявалася юрыд. і матэрыяльнае становішча рус. правасл. царквы. Першая такая грамата дадзена вял. кн. кіеўскім Уладзімірам Святаславічам у 996 новазбудаванай Кіеўскай Дзесяціннай царкве, на карысць якой вызначана дзесятая доля кожнага штрафу з княжацкага суда, гандл. здзелак, княжацкай даніны, штогадовага ўраджаю і прыплоду свойскай жывёлы насельніцтва. Другой граматай 1007—11 Уладзімір Святаславіч пацвердзіў рус. царкве права суда па духоўных справах паводле норм візант. права. У 11—12 ст. абедзве граматы аб'яднаны ў т.зв. «Статут Уладзіміра» (да 17 ст. з'явілася 7 яго рэдакцый; захавалася больш за 200 спісаў статута 14—19 ст.). У Тураўскай епіскапіі ў 14 ст. складзена асобная рэдакцыя «Статута Уладзіміра», у якой удакладнены віды і памеры дзесяціны на карысць епіскапа і распрацаваны парадак духоўнага суда (захаваўся ў спісе сярэдзіны 17 ст.). У час праўлення вял. кн. кіеўскага Яраслава Уладзіміравіча Мудрага [1019—54] складзены «Статут Яраслава» — кодэкс сямейнага і шлюбнага права Русі (да 16 ст. ўзнікла 6 рэдакцый статута больш чым у 90 спісах). У 1499 вял. кн. ВКЛ *Аляксандр* па просьбе мітрапаліта кіеўскага Іосіфа зацвердзіў дзеянне статута ў ВКЛ; гэтая грамата пацвярджалася каралямі польскімі і вял. кн. ВКЛ Уладзіславам IV у 1638 і Станіславам Аўгустам Панятоўскім у 1766. На Беларусі ў 15 — пач. 16 ст. ўзнікла асобная рэдакцыя «Статута Яраслава» (т.зв. «Скрутак Яраслава»). Яго дзеянне Аляксандр пацвердзіў у 1502 па просьбе епіскапа полацкага і луцкага Лукі. «Скрутак Яраслава», замацаваны подпісам уніяцкага мітрапаліта І.Вельямін-Руцкага, зафіксаваны полацкім архіепіскапам І.*Кунцэвічам* ў актавай кнізе 1619—20 віцебскага земскага суда. Комплекс з 4 грамат 12 — пач. 13 ст. смаленскай кафедральнай царквы Багародзіцы захаваўся ў спісе 1-й пал. 16 ст.; на карысць новазаснаванай Смаленскай епіскапскай кафедры вызначаны дзесятая доля княжацкай даніны, зямельныя падараванні, падсудныя епіскапу справы. У комплекс тураўскіх статутных запісаў уваходзяць грамата вял. кн. кіеўскага Уладзіміра Святаславіча 1005—06 пра заснаванне Тураўскай епіскапіі (верагоднасць дакумента спрэчная; магчыма, ён складзены ў 14 ст.) і статутны запіс 14 ст. аб дзесяціне (пэўнай долі ад гандл. здзелак і вытв-сці моцных напіткаў) на карысць тураўскага епіскапа (дакументы захаваліся ў спісе сярэдзіны 17 ст.). Мясц. характар мелі статуныя граматы цэрквам 12—15 ст. наўгародскіх кн. Святаслава Ольгавіча, Яраслава, Усевалада Мсціслававіча, галіцкага кн. Льва Данілавіча, луцкага і ўладзімірскага кн. Любарта Гедзімінавіча 1321, маскоўскага вял. кн. Васіля Дзмітрыевіча 1404, кіеўскага кн. Аляксандра (Алелькі) Уладзіміравіча 1441 і інш. *В.С.Пазднякоў.*

ЦАРКО́ЎНЫЯ СЯЛЯ́НЕ ў Расіі, катэгорыя залежных сялян, якія ў 11—18 ст. належалі правасл. царкве. У 15—18 ст. Ц.с. валодалі патрыяршая (з 1589), мітрапаліцкая і епіскапскія кафедры, манастыры (гл. *Манастырскія сяляне*), гал. храмы Масквы, Уладзіміра і інш. Пасля *секулярызацыі* царк. і манастырскіх зямель (1764) з б. Ц.с. утворана катэгорыя *эканамічных сялян*. На Беларусі, пасля яе далучэння да Рас. імперыі (1772—95), сяляне, якія належалі каталіцкай, уніяцкай і правасл. цэрквам, заставаліся ў іх уладанні яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў, хоць колькасць іх паступова змяншалася. У 1841—44 яны (больш як 87 тыс. «рэвізскіх душ») перайшлі ва ўласнасць дзяржавы.

ЦАРЛІ́НА (Zarlino) Джазэфа (31.1 ці да 22.3.1517, г. К'ёджа, Італія — 4 ці 14.2.1590), італьянскі кампазітар, арганіст, муз. тэарэтык эпохі Адраджэння. Адзін з заснавальнікаў вучэння аб *гармоніі*, тэорыі поліфанічных форм, стваральнік вучэння пра *кантрапункт*. Быў святаром, з 1565 кіраўнік капэлы сабора Сан-Марка ў Венецыі. Яго дзейнасць звязана з *Венецыянскай школай*. Сярод твораў месы, матэты, мадрыгалы і інш. (збераглася невял. колькасць). Аўтар фундамент. муз.-тэарэт. прац.

ЦАРО́Ў Аляксей Андрэевіч (9.4.1921, г. Кемерава, Расія — 21.3.1978), бел. і расійскі акцёр. Засл. арт. Беларусі (1968). Скончыў студыю пры т-ры «Чырвоны факел» (г. Новасібірск), з 1940 працаваў у ім. З 1947 у Кемераўскім, з 1953 у Гродзенскім абл. драм. т-рах. Характарны акцёр. Яго творчасці ўласцівы дакладнасць дэталей, востры знешні малюнак ролі, верагоднасць. Сярод роляў у Гродзенскім т-ры: Крысюкевіч («Пад зоркамі» паводле П.Пестрака), Кічкайла («Амністыя» М.Матукоўскага), Цярэшка («Грыбунал» А.Макаёнка), Кулігін («Навальніца» А.Астроўскага), капітан Сахараў («Порт-Артур» паводле А.Сцяпанава), Бондараў («Перабежчык» А. і П. Тур), Таланаў («Нашэсце» Л.Лявонава), граф Федэрыка («Сабака на сене» Лопэ дэ Вэгі), Маёр («Дамы і гусары» А.Фрэдры).

ЦАРО́Ў Генадзь Яўгенавіч (н. 19.5.1941, Масква), бел. кларнетыст, педагог. Засл. арт. Беларусі (1999). Скончыў Саратаўскую кансерваторыю (1964). З 1974 артыст аркестра — кларнетыст, з 1999 вядучы майстар сцэны сімф. аркестра Нац. акад. т-ра оперы Беларусі. Адначасова ў 1977—87 выкладчык Мінскага муз. вучылішча, з 1993 — Бел. акадэміі музыкі. Для ігры Ц. характэрна вытанчанасць, прыгажосць гуку, віртуознасць. Першы выканаўца твораў бел. кампазітараў для кларнета Л.Шлег, М.Марозавай.

ЦАРО́Ў Міхаіл Іванавіч (1.12.1903, г. Цвер, Расія — 10.11.1987), расійскі акцёр, педагог. Нар. арт. СССР (1949). Герой Сац. Працы (1973). Скончыў Петраградскую школу рус. драмы (1921). На сцэне з 1920 (Вял. драм. т-р). З 1923 у розных т-рах Расіі. З 1931 у Ленінградскім акад. т-ры драмы, з 1933 у Т-ры імя У.Меерхольда, з 1937 у Малым т-ры (у 1950—67 і 1970—85 дырэктар, з 1985 маст. кіраўнік). З 1935 выкладаў у тэатр. навуч. установах, з 1941 у Тэатр. вучылішчы імя Шчэпкіна (з 1962 праф.). Яго мастацтва вылучалася яркімі сац.-псіхал. характарыстыкамі персанажаў, высокай культурай сцэн. мовы, мяккім гумарам і трапнай сатырай. Сярод лепшых роляў: Чацкі, Фамусаў («Гора ад розуму» А.Грыбаедава), Глумаў, Нязнамаў, Жадаў («На ўсякага мудраца хапае прастаты», «Без віны вінаватыя», «Даходнае месца» А.Астроўскага), Арбенін («Маскарад» М.Лермантава), Пратасаў («Жывы труп» Л.Талстога), Дон Карлас

(«Дон Жуан» Мальера), Макбет («Макбет» У.Шэкспіра), Арман Дзюваль («Дама з камеліямі» А.Дзюма-сына), Хігінс («Пігмаліён» Б.Шоу), Матыяс Клаўзен («Перад заходам сонца» Г.Гаўптмана), Верына («Змова Фіеска ў Генуі» Ф.Шылера), Бароўскі («За тых, хто ў моры» Б.Лаўранёва) і інш. Сярод пастановак «Гора ад розуму» (1975, з В.Івановым). У 1964—86 старшыня праўлення Усесаюзнага т-ва драм. і кінаактораў. Дэп. Вярх. Савета СССР 1966—74. Нар. арт. СССР (1965). Герой Сац. Працы (1976). Ганаровы грамадзянін г. Віцебска (1976). Лаўр. Дзярж. прэміі СССР 1947, 1969. Дзярж. прэмія Расіі 1977.

М.Цароў у ролі Чацкага.

Тв.: Что такое театр. М., 1960; Неповторимые мгновения. М., 1975; Малый театр. М., 1976.

Літ.: Л е й к и н Н. Мудрое искусство Михаила Царева // Актер, актер и еще раз актер... М., 1975. *Л.В.Календа.*

ЦА́РСКАЯ ГАРЭ́ЛКА, сумесь канцэнтраваных азотнай і салянай кіслот (1:3 па аб'ёме).

Вадкасць жоўтага колеру з пахам хлору і вокіслаў азоту. Моцны акісляльнік. Растварае ўсе металы, у т.л. золата («цара металаў», адсюль назва) і плаціну, за выключэннем серабра, родыю, ірыдыю. Выкарыстоўваюць як акісляльнік у аналіт. хіміі, пры *афінажы* золата, плаціны і інш.

ЦА́РСКІЯ ВАРО́ТЫ, у праваслаўных або уніяцкіх храмах 2-створкавыя дзверы ў цэнтры ніжняга яруса іканастаса, якія злучаюць алтар з асноўным аб'ёмам інтэр'ера.

На Беларусі Ц.в. захаваліся з 16 ст. Звычайна іх рабілі з дрэва, упрыгожвалі рэльефнай або ажурнай разьбой, палі-хромнай размалёўкай, пазалотай адпаведна пануючаму маст. стылю і характару аздаблення іканастаса. Паводле канона, у верхняй частцы Ц.в. змяшчалі кампазіцыю «Дабравешчанне», а ніжэй, у клеймах — выявы евангелістаў Лукі, Іаана, Марка, Матфея. Часам кампазіцыю «Дабравешчанне» замянялі інш. сюжэтамі (напр., у *Віцебскіх царскіх варотах*). У некат. творах адбіўся моцны ўплыў т.зв. нар. прымітыву: Ц.в. з вёсак Дабраслаўка Пінскага (1-я пал. 17 ст.), Стрэльна Іванаўскага (18 ст.) р-наў. У канцы 18 — пач. 19 ст. Ц.в.часта плялі з саломкі, аздаблялі каштоўнымі тканінамі (захаваліся Ц.в. з вёсак Вавулічы Драгічынскага, Лемяшэвічы Пінскага р-наў, Гродзенскай Барысаглебскай царквы). Іл. гл. таксама да арт. *Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва*. *Э.І.Вецер.*

Царскія вароты 18 ст. Беларуская школа.

ЦА́РСКІЯ КУРГАНЫ́, пахавальныя помнікі *скіфаў* у Паўн. Прычарнамор'і ў 4 — пач. 3 ст. да н.э. Сканцэнтраваны пераважна ў Ніжнім Падняпроўі, Запарожжы, на Керчанскім п-ве, каля Растова (*Чартамлык, Салоха,* Тоўстая магіла, Мелітопальскі, *Куль-Аба* і інш.). Адметныя высокімі насыпамі (да 20 м) і пахавальнымі пабудовамі, апушчанымі ў грунт (да 10—12 м). На Керчанскім п-ве Ц.к. — вялізныя наземныя скляпы з камянёў. Нябожчыкаў хавалі ў раскошным адзенні, накрывалі пакрываламі, аздобленымі залатымі бляшкамі і пласцінамі. Разам з імі ў адмысловыя тайнікі клалі залатыя ўпрыгожанні, рытуальны посуд з каштоўных металаў і парадную зброю — шлемы, панцыры, шчыты, лукі, коп'і і інш. У камерах-катакомбах змяшчалі запасы віна ў амфарах, бронзавыя катлы і інш. Пахаванне важных асоб звычайна суправаджалася пахаваннямі гвалтоўна забітай чэлядзі, а таксама коней (да 12) у спец. выкапаных магілах. У Ц.к. знойдзены высокамастацкія творы грэчаскіх майстроў, часта аздобленыя кампазіцыямі на сюжэты скіфскіх міфаў. Найб. багатыя магілы даследчыкі разглядаюць як пахаванні скіфскіх цароў, астатнія — скіфскай знаці. Некаторыя Ц.к. акрамя асн. цэнтральных магіл маюць яшчэ і бакавыя (Салоха, Тоўстая магіла).

ЦА́РСТВА ў б і я л о г і і, самая высокая таксанамічная катэгорыя ў сістэме арганізмаў. Афіцыйна прызнаецца Міжнар. кодэксамі наменклатур бат., заал., бактэрый. З часоў Арыстоцеля ўсе жывыя арганізмы падзялялі на 2 Ц.: *жывёлы* і *расліны*. Сучасная навука вылучае 2 таксоны больш высокага рангу — надцарствы: *пракарыёты* і *эўкарыёты*. Надцарства пракарыётаў уключае 2 Ц.: *архебактэрыі* і *бактэрыі* (у т.л. *цыянабактэрыі*); у надцарстве эўкарыётаў 3 Ц.: жывёлы, *грыбы* і расліны. Ц. падзяляюць на падцарствы і далей на *тыпы* (аддзелы). У *біягеаграфічным раянаванні* Ц. — вышэйшы ранг пры раянаванні сушы і Сусв. акіяна.

ЦА́РСТВА ПО́ЛЬСКАЕ, гл. ў арт. *Каралеўства Польскае.*

ЦА́РСТВЫ БІЯГЕАГРАФІ́ЧНЫЯ, найбуйнейшыя адзінкі *біягеаграфічнага раянавання* зямнога шара. Часам Ц.б. наз. біягеагр. вобласці (напр., Галарктычнае Ц.б.).

ЦАРУ́К Уладзімір Зянонавіч (20.12.1899, в. Вялікая Вобрына Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл. — 27.1.1957), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў падполля і партыз. руху на тэр. Баранавіцкай вобл. ў Вял. Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Удзельнік грамадз. вайны 1918—20. З 1920 на падп. рабоце ў Зах. Беларусі; у 1926—39 зняволены польск. ўладамі ў турму. У Вял. Айч. вайну сакратар Стаўбцоўскага міжрайкома КП(б)Б, пам. упаўнаважанага ЦК КП(б)Б і БШПР па Мірскім і Стаўбцоўскім р-нах, з ліп. 1943 чл. Баранавіцкага падп. абкома КП(б)Б, адначасова з кастрычніка кіраўнік Стаўбцоўскага падп. міжрайпартцэнтра, камандзір Стаўбцоўскага партыз. злучэння. Пасля вайны на парт. і сав. рабоце ў Стоўбцах, Баранавічах. Дэп. Вярх. Савета БССР у 1940—47 і з 1955, Вярх. Савета СССР у 1946—54. У в. Ярэмічы Карэліцкага р-на помнік.

ЦАРУКА́ЕЎ Аляксандр Ібрагімавіч (12.12.1918, с. Карман-Сіндзікаў, Паўн. Асецыя — Аланія — 12.12.2000), асецінскі пісьменнік. Нар. пісьменнік Паўн. Асеціі (1988). Скончыў Паўн.-Асецінскі пед. ін-т (1951), Літ. ін-т імя М.Горкага ў Маскве (1957). З 1951 працаваў у выд-ве «Ір». Друкаваўся з 1933. Аўтар паэт. зб-каў «Вершы» (1947), «Ранішнія песні» (1952), «Вясёлка» (1959), «Калыска жыцця» (1965), «Ад бацькі да сына» (1978), зб. апавяданняў «Здавалася мне — ведаю цябе» (1967). Пісаў для дзяцей. Перакладаў на асецінскую мову. *А.С.Пухаеў.*

ЦАРЫКАЎ Барыс Андрэевіч (31.10.1926, г. Гомель — 13.11.1943), Герой Сав. Саюза (1943). У Вял. Айч. вайну са снеж. 1941 да кастр. 1942 у партызанах. Са

студз. 1943 на Цэнтр. фронце, удзельнік Курскай бітвы, фарсіравання Дзясны. Разведчык радавы Ц. вызначыўся ў баях каля г.п. Лоеў: 15.10.1943 з групай мінёраў першы фарсіраваў Дняпро і 5 сутак вёў баі за пашырэнне плацдарма, зрабіў 9 рэйсаў на левы бераг, пераправіўшы параненых і данясенні ў штаб палка; загінуў у баі; у в. Зябраўка Гомельскага р-на помнік.

У.З.Царук.

Б.А.Царыкаў.

ЦАЦА́РКІ СВО́ЙСКІЯ, птушкі сям. цацарак атр. курыных. Паходзяць ад дзікай шэрай цацаркі, прыручанай каля 3 тыс. г. назад у Гвінеі. На Беларусі вядомы з 16 ст. як дэкар. птушкі. Гадуюць аматары на мяса і яйкі. Пашыраны Ц.с. шэра-рабой, белай і блакітнай разнавіднасцей і белагрудай пароднай групы.

Палавы дымарфізм слаба выражаны. Тулава авальнае, даўж. 35—40 см. Галава без апярэння, з карычневым скурыстым грэбенем з касцявой асновай і шчыльнымі бела-чырв. завушніцамі. Крылы невял., закругленыя, шчыльна прыціснутыя да тулава. Ногі кароткія, самцы не маюць шпор. Маса самцоў 1,5 кг, самак 1,7, бройлераў (10—11-тыднёвы ўзрост) каля 1 кг. Мяса маладняку далікатнае, смакам нагадвае дзічыну. Палавая спеласць у 7—8 мес. Жывуць 5—8 гадоў. Яйцаноскасць 120 яец за год (па 40—47 г). Яйцы з моцнай шкарлупінай, захоўваюць харч. каштоўнасць да 1 года (пры т-ры 10—15 °С). Дарослыя птушкі непатрабавальныя да ўмоў утрымання, больш устойлівыя да інфекц. і інвазійных хвароб, чым інш. с.-г. птушкі.

ЦА́ЦКА, прадмет, прызначаны для дзіцячых гульняў. Узнаўляючы рэальныя і ўяўныя рэчы і вобразы, дапамагае дзіцяці пазнаваць навакольны свет, служыць адным са сродкаў разумовага, эстэт. і фіз. выхавання. Змест і знешні выгляд Ц. вызначаюцца канкрэтнымі выхаваўчымі задачамі ў адпаведнасці з узростам, развіццём і інтарэсамі дзіцяці. Паводле прызначэння адрозніваюць дыдактычныя, тэхн., тэатр., муз., спарт., Ц.-забаўкі. Звычайна Ц. нясе на сабе адбітак сац. ладу грамадства, узроўню яго культуры, нац. маст. традыцый і эстэт. запатрабаванняў. Ц. выкарыстоўваюць таксама як сувеніры, маст. выраб для аздаблення інтэр'ера. Ц. вядома са старажытнасці ўсім народам свету.

На Беларусі найб. стараж. і пашыраная — гліняная Ц., раннія ўзоры якой адносяцца да неаліту. Асабліва багатыя і разнастайныя іх знаходкі пры раскопках курганоў і гарадзішчаў часоў жал. веку: бразготкі (пустацелыя гліняныя шарыкі, яйкі з каменьчыкамі ці гліняным шарыкам унутры), фігурныя Ц.-свістулькі. На думку даследчыкаў, у першабытныя часы такія Ц. мелі таксама рытуальнае прызначэнне, свіст і бразганне павінны былі адганяць «злых духаў». Фігуркі людзей, якія абазначалі продкаў, хатніх жывёл, ляпілі з надзеяй паўплываць на дабрабыт сям'і. Масавы рамесніцкі выраб гліняных Ц. пачаўся з 11—13 ст. разам з развіццём ганчарства. Свістулькі ў выглядзе птушак і конікаў, фігуркі людзей, бразготкі знойдзены на тэр. стараж. Гродна, Ваўкавыска, Магілёва, Мсціслава і інш. Яны вызначаюцца абагульненасцю форм і вобразаў, створаных найпрасцейшымі прыёмамі лепкі. Сярод знаходак 16—17 ст. сустракаюцца вырабы, упрыгожаныя зялёнай, карычневай, празрыстай палівай. Мастацтва гліняных Ц. дасягнула росквіту ў 19—1-й пал. 20 ст., калі іх выраблялі амаль ва ўсіх ганчарных цэнтрах Беларусі. Для большасці Ц. характэрна выпрацаваная яшчэ ў старажытнасці стылістыка — абагульненасць, стылізаванасць і ўмоўнасць форм. Звычайна іх пакрывалі зялёнай, карычневай, або жоўтай палівай, а ў традыц. цэнтрах чорназадымленай керамікі яны мелі чорны колер. Асаблівай архаічнасцю вызначаецца гліняная Ц. Падняпроўя — з Дуброўна (гл. *Дубровенская кераміка*), Дрыбіна, Магілёва, што адлюстроўваюць загадкавых паўптушак-паўконей (аналагічных знаходкам з курганоў Верхняга Падняпроўя). Класічная дасканаласць і гранічная абагульненасць форм уласціва вырабам з вёсак Харосіца, Весялова, Сланева Навагрудскага р-на, дзе ў 1-й пал. 20 ст. існаваў самаст. промысел па іх вытв-сці. З канца 19 ст. пашырыліся таксама Ц. наіўнарэаліст. характару: дакладна і падрабязна мадэляваныя фігуркі жывёл, людзей у тагачасным адзенні, часта ў нескладаным дзеянні. Найб. яркія ўзоры — вырабы майстроў 1920—30-х г. з Ракава (гл. *Ракаўская кераміка*). Значнае пашырэнне ў нар. побыце мелі драўл. Ц. звычайна з імітацыяй рухаў ці дзеяння: «Кавалі», «Пілавальшчыкі», «Конікі», «Кураняты дзяўбуць зерне», «Зайцы б'юць у барабан» і інш. У канцы 19 — пач. 20 ст. выраб драўл. Ц. часта меў

Цацкі «Конікі» з в. Ракаў Валожынскага раёна Мінскай вобл. 1930-я г.

1 2

Цацаркі свойскія: 1 — серабрыста-шэрыя; 2 — белыя.

характар промыслу, іх масава прадавалі на кірмашах, вывозілі за межы Беларусі. Вобразы жывёл і людзей трактаваліся звычайна схематычна, умоўна. Часам вырабы афарбоўвалі, а фігуркі людзей (лялькі) аздаблялі кавалачкамі тканіны. Пэўнае пашырэнне мелі Ц. з саломы (гл. ў арт. *Саломка мастацкая*), якія рабілі з па-рознаму складзеных і неравязаных саламяных пучкоў. Прынцып іх стварэння выкарыстаны і развіты сучаснымі майстрамі саломапляцення. Шырока бытавалі разнастайныя самаробныя Ц. з падручных матэрыялаў: кары, лучынак, шышак, жалудоў, абрэзкаў тканін і інш. Асновай лялькі звычайна служыла драўляная цурка, да якой мацавалі валасы з кудзелі, вугалем малявалі твар, а з кавалачкаў тканіны шылі адзенне. Для дзяцей выраблялі таксама цацачную мэблю, посуд, прылады працы. У наш час Ц. для дзяцей і сувенірныя Ц. вырабляюць на прамысл. прадпрыемствах і ф-ках маст. вырабаў.

Літ.: Сахута Я. Беларуская народная гліняная цацка. Мн., 1982; Яго ж. Народное искусство и художественные промыслы Белоруссии. Мн., 1982; Яго ж. Беларуская народная кераміка. Мн., 1987; Яго ж. Народнае мастацтва Беларусі. Мн., 1997; Милюченков С.А. Белорусское народное гончарство. Мн., 1984.

Я.М.Сахута.

Дж.Цвейг.

ЦВЕЙГ (Zweig) Джордж (н. 20.5.1937, Масква), амерыканскі фізік. Чл. Нац. АН ЗША (1996), Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1999). З 1938 у ЗША. Скончыў Мічыганскі ун-т (1959) і Каліфарнійскі тэхнал. ін-т (1963), у якім працаваў у 1964—98 (з 1967 праф.). Адначасова з 1981 у Лос-Аламаскай нац. лабараторыі, з 1999 у Масачусецкім тэхнал. ін-це. Навук. працы па фізіцы элементарных часціц, лічбавай апрацоўцы сігналаў, біяфізіцы і нейрабіялогіі. Незалежна ад М.*Гел-Мана* пастуліраваў існаванне кваркаў і прапанаваў кварка-вую мадэль адронаў (1963).

М.М.Касцюковіч.

ЦВЕР, горад, цэнтр Цвярской вобл., у Расіі, на р. Волга. Вядомы з 1164. У 1931—90 наз. Калінін. 456 тыс. ж. (2001). Чыг. станцыя. Рачны порт. Аэрапорт. Прам-сць: машынабудаванне (вагоны, экскаватары, кавальскія штампы, электраапаратура, абсталяванне для прам-сці буд. матэрыялаў), хім. (штучныя скуры, тканіны, плёначныя матэрыялы, кінаэкраны), тэкст. (баваўняная, шаўковая, шарсцяная), паліграф., харч., мэблевая; вытв-сць буд. матэрыялаў. Ун-т, політэхнічны і с.-г. ін-ты, мед. акадэмія, Ваен. акадэмія ППА. 3 тэатры, у т.л. драматычны. Помнікі: А.Нікіціну (1955), І.Крылову (1959), А.Пушкіну (1974). Музеі: гіст.-арх. і літаратурны, М.Салтыкова-Шчадрына, «Гарадская сядзіба», «Цвярская мануфактура», карцінная галерэя, Маладзёжны музейна-выставачны цэнтр імя Л.Чайкінай. Цырк.

Узнікла ў 12 ст. з рамесна-гандл. паселішчаў каля манастыра паблізу вусця р. Цверца (адсюль назва). Упершыню ў пісьмовых крыніцах згадваецца каля 1164. Першапачаткова належала Ноўгараду, з 1209 — Уладзіміра-Суздальскаму княству. У 1238 разбурана войскамі хана Батыя. З 1240-х г. — сталіца *Цвярскога княства*, гал. сапернік Масквы ў барацьбе за аб'яднанне рус. зямель; была ў добрых і саюзніцкіх адносінах з ВКЛ. У 1-й пал. 14 ст. Ц. узначаліла супраціўленне татара-мангольскім заваёўнікам (Барценеўская бітва 1317, паўстанне 1327). У 14—15 ст. Ц. — важны эканам. цэнтр Паўн.-Усх. Русі, гандлявала з Прыбалтыкай, ВКЛ, Каўказам, Сярэдняй Азіяй і Б. Усходам. У 1466—72 з Ц. здзейсніў падарожжа ў Індыю цвярскі купец Афанасій Нікіцін. У 1485 пры Іване III далучана да Маскоўскага княства. У 18 — пач. 19 ст. з пабудовай Вышневалоцкай водная сістэмы і дарогі Масква—Пецярбург Ц. — цэнтр транзітнага гандлю уральскім жалезам і збожжам. З 1775 цэнтр Цвярской губ. Буд-ва цераз Ц. цыпункі (1851) садзейнічала прамысл. развіццю, з сярэдзіны 19 ст.



Цвер. Царква «Белая Тройца».

буйны цэнтр тэкст. прам-сці. У 1931—90 наз. Калінін, з 1935 цэнтр аднайм. вобласці. У Вял. Айч. вайну ў кастр.—снеж. 1941 акупіравана ням. фашыстамі, моцна разбурана.

Горад забудоўваўся пераважна пасля пажару 1763 паводле плана (1763—67, арх. П.Нікіцін, М.Казакоў, А.Квасаў і інш.), у аснове якога — 3-прамянёвая кампазіцыя з 4 плошчамі на цэнтр. магістралі. Сярод помнікаў: класіцыстычныя пуцявы палац Кацярыны II (1763—67, арх. Казакоў; дабудаваны ў 1809—12, арх. К.Росі), ансамблі будынкаў Дваранскага дома (1766—70) і б. магістрата (1770—80), з элементамі барока — царква Узнясення (1833), будынак Дваранскага сходу з калоннай залай (1841, абодва арх. І.Львоў), мужчынская гімназія (1844, арх. К.Гельдэнрэйх). На б. ускраіне Ц. — цэрквы «Белая Тройца» (1564, перабудавана), Казанская (1779—99), Успенскі сабор (1722).

Літ.: Памятники истории и культуры Калининской области. Калинин, 1988; Тверь: Справ.-путеводитель. Тверь, 1993.

ЦВЕРДАКРЫ́ЛЫЯ, атрад насякомых; гл. *Жукі*.

ЦВЕРДАЛІ́СТЫЯ ЛЯСЫ́, вечназялёныя лясы, пераважна з ксерафільных, цвердалістых парод. Дрэвавы полаг аднаярусны, з густым падлескам з вечназялёных хмызнякоў. Кроны шырокія, лісце склерафільнай будовы (гл. *Склерафіты*), ствалы ўкрыты магутнай коркай. Пашыраны ў субтрапічных раёнах з міжземнаморскім тыпам клімату. Найб. тыповыя лясы ў Міжземнамор'і (з коркавага і каменнага дубу, сунічнага дрэва, верасу, мірту і інш.), у ЗША і Чылі (з вечназялёнага дубу і сунічнага дрэва), у Аўстраліі (з эўкаліпту, акацыі і казуарынаў). У выніку антрапагеннага ўздзеяння зменьваюцца цвердалістымі хмызнякамі (*маквіс, гарыга* ў Міжземнамор'і, чапараль у Каліфорніі, *скрэб* у Аўстраліі).

ЦВЕРДАПА́ЛІЎНЫ РАКЕ́ТНЫ РУХАВІ́К, *ракетны рухавік*, які працуе на цвёрдым *ракетным паліве*. Зарад цвёрдага паліва (канальна-шчылінны, зоркападобны і інш.) знаходзіцца ўнутры камеры згарання. Рухавік запускаецца падачай эл. імпульсу на запальнік, ад якога загараецца запал, што выклікае гарэнне паліва. Ц.р.р. выкарыстоўваюцца ў авіяц. і касм. тэхніцы як паскаральнікі ўзлёту самалётаў, для аддзялення і адводу адпрацаваных ступеней касм. ракет, забеспячэння мяккай пасадкі і інш.

ЦВЕРДАФА́ЗНЫЯ РЭА́КЦЫІ ў аналітычнай хіміі, рэакцыі паміж цвёрдымі рэчывамі, якія выяўляюцца па з'яўленні характэрнай афарбоўкі. Да Ц.р. адносяцца таксама рэакцыі, у выніку якіх адбываецца выпаданне ці растварэнне афарбаванага асадку. Выкарыстоўваюцца ў палявых умовах для ідэнтыфікацыі мінералаў, руд, хім. удабрэнняў і інш. Гл. таксама *Хімія цвёрдага цела*.

ЦВЕРДАЦЕ́ЛЬНЫ ЛА́ЗЕР, аптычны квантавы генератар *(лазер)* з крышт. ці аморфным асяроддзем, легіраваным актыўнымі іонамі, на якіх ажыццяўляецца лазерная генерацыя пры знешнім аптычным узбуджэнні. Асобная група Ц.л. — *паўправадніковыя лазеры*.

Першы Ц.л. на крышталі *рубіну* створаны амер. вучоным Т.Мейманам (1960). У наш час вядома больш за 400 дыэл. крышталёў, аптычных валокнаў і шкла з дамешкамі, дзе выяўляецца лазерны эфект. Найб. пашыраны Ц.л. на алюмаітрыевым ці галій-скандый-іт-

рыевым гранаце з неадымам, сапфіры з тытанам, александрыце і інш. Інверсная заселенасць узроўняў энергіі (гл. *Актыўнае асяроддзе*) дасягаецца ўзбуджэннем актыўных іонаў легіруючага рэчыва — рэдказямельных элементаў (неадым, эрбій) ці пераходных металаў (хром) — знешнімі крыніцамі святла, напр., газаразраднай лямпай. Выкарыстоўваюцца ў тэхнал. і мед. установах, дальнамерах і прыцэлах, апаратуры аптычнага запісу і счытвання інфармацыі, гідралакацыі, спектраскапіі, сістэмах лазернага тэрмаядз. сінтэзу і інш. *Л.М.Арлоў.*

ЦВЕТ Міхаіл Сямёнавіч (14.5.1872, г. Асты, Італія — 26.6.1919), рускі вучоны ў галіне фізіялогіі і біяхіміі раслін. Скончыў Жэнеўскі ун-т (1893). З 1896 у Пецярбургскай АН, з 1902 у Варшаўскім ун-це, з 1908 у Варшаўскім політэхн. ін-це (з 1910 д-р навук), з 1917 праф. Юр'еўскага, з 1918 — Варонежскага ун-таў. Навук. працы па вывучэнні пластыд і пігментаў раслін і распрацоўцы метадаў іх даследавання. Асобае значэнне маюць створаны Ц. метад раздзялення рэчываў, заснаваны на выбіральным паглынанні асобных кампанентаў сумесі, што аналізуецца рознымі адсарбентамі (1903—10). Метад дазволіў даказаць неаднароднасць зял. і жоўтага пігментаў лісця раслін і вылучыць у чыстым стане хларафілы a, b і c, шэраг ізамераў *ксантафілу*. Метад атрымаў шырокае выкарыстанне з пач. 1930-х г., калі яго пачалі ўжываць для раздзялення і ідэнтыфікацыі пігментаў, вітамінаў, ферментаў, гармонаў і інш. неарган. і арган. злучэнняў. Ён паслужыў асновай для стварэння новых кірункаў *храматаграфіі*. У фізіялогіі раслін вядомы працы Ц. пра прыроду хларапластаў, стан хларафілу ў расліне, механізмы *фотасінтэзу* і інш.

Тв.: Хроматографический адсорбционный анализ: Избр. работы. М.; Л., 1946.

Літ.: Сенченкова Е.М. М.С.Цвет. М., 1973.





Цвердапаліўны ракетны рухавік: а — схема (1 — запал, 2 — запальнік, 3 — зарад цвёрдага паліва, 4 — сопла); б — папярочны разрэз (1 — канал зараду і яго змены пры згаранні, 2 — зарад, 3 — адгезійныя слаі, 4 — цеплаізаляцыйны слой, 5 — корпус).

ЦВЁРДАЕ ЦЕ́ЛА, *агрэгатны стан рэчыва*, што адрозніваецца стабільнасцю формы і характарам цеплавога руху атамаў (малекул), якія здзяйсняюць малыя ваганні вакол стану раўнавагі.

Бывае крышталічнае і аморфнае. У крышталічных Ц.ц. існуе прасторавая перыядычнасць у размяшчэнні раўнаважных станаў атамаў (гл. *Крышталі*). У аморфных Ц. ц. атамы вагаюцца вакол хаатычна размешчаных пунктаў (гл. *Аморфны стан*). Устойлівым станам Ц.ц. з'яўляецца крышталічны. Паводле тыпу *хімічнай сувязі* паміж атамамі адрозніваюць Ц.ц. з *іоннай сувяззю, кавалентнай сувяззю, металічнай сувяззю* і інш., што абумоўліве разнастайнасць іх фіз. уласцівасцей. Эл. і некаторыя інш. ўласцівасці Ц.ц. ў асн. вызначаюцца характарам руху знешніх электронаў яго атамаў. Паводле эл. уласцівасцей Ц.ц. падзяляюцца на *дыэлектрыкі, паўправаднікі* і *металы*; паводле магнітных — на *дыямагнетыкі, парамагнетыкі* і целы з упарадкаванай магн. структурай (гл. *Антыферамагнетыкі, Ферамагнетыкі, Ферымагнетыкі*). Уласцівасці Ц.ц. даследуе *фізіка цвёрдага цела*.

На Беларусі даследаванні па фізіцы Ц.ц. пачаліся з 1930-х г. у БДУ, з 1957 сістэматычна праводзяцца ў Ін-це фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў і Фізіка-тэхн. ін-це Нац. АН, БДУ і інш.

М.А.Паклонскі.

ЦВЁРДАСЦЬ матэрыялаў, супраціўленне цвёрдага цела змене формы або разбурэнню паверхні пры мясц. сілавых уздзеяннях. Залежыць ад структуры, атамнай будовы і інш. уласцівасцей матэрыялу. Характарыстыкі Ц. металаў, мінералаў і інш. матэрыялаў выкарыстоўваюць пры выкананні канструкцыйных разлікаў машын, пры абгрунтаванні тэхнал. працэсаў у машынабудаванні, алмазнай і буд. вытв-сці.

Ц. металаў вымяраюць метадамі, заснаванымі на ўціскванні шарыка з загартаванай сталі *(Брынеля метад)*, алмазнага конуса *(Роквела метад)* або алмазнай піраміды *(Вікерса метад)*. Ц. абазначаецца: НВ па Брынелю, HR па Роквелу і HV па Вікерсу (літара H адпавядае англ. hardness — Ц., жорсткасць). Набываюць пашырэнне метады, заснаваныя на выкарыстанні ультрагукавых ваганняў. Ц. мінералаў вызначаюць па шкале Моаса — мінералагічнай шкале Ц. драпаннем гранямі эталоннага мінералу (прапанавана ням. мінералогам Ф.Моасам у 1811). Ц. алмазу па гэтай шкале прынята роўнай 10, тальку — 1. Для вымярэння Ц. асфальтабетону і інш. дарожна-буд. матэрыялаў выкарыстоўваюць цвердамеры, у якіх Ц. вызначаецца глыбінёй пранікнення конуса ці інш. формы ін'ектара. *І.І.Леановіч.*

ЦВЁРДАЯ ПШАНІ́ЦА, гл. ў арт. *Пшаніца*.

ЦВЁРДЫ СЦЁК рэк, маса завіслых, донных (перамяшчаюцца па дне патоку) і растворaных у вадзе рэчываў, якія пераносяцца ракой праз папярочнае сячэнне за пэўны перыяд часу. Колькасць наносаў сведчыць аб інтэнсіўнасці эразійных працэсаў, ступені мех. забруджанасці вады і характарызуецца каламутнасцю вады — колькасцю цвёрдага рэчыва ў адзінцы аб'ёму вады (у г/м^3 або мг/л). Амаль усе рэкі Беларусі маюць малую каламутнасць — каля 25 г/м^3.

ЦВЁРДЫЯ РАСТВО́РЫ, крышталічныя ці аморфныя рэчывы пераменнага саставу, якія складаюцца з двух і больш кампанентаў і застаюцца аднароднымі пры змене суадносін паміж імі.

Адрозніваюць Ц.р. замяшчэння, укаранення і адымання. У Ц.р. замяшчэння атамы (іоны) аднаго хім. элемента замяшчаюць частку атамаў другога элемента ў вузлах яго крышт. рашоткі; утвараюцца, калі памеры атамаў кампанентаў сувымерныя, а іх хім. і фіз. ўласцівасці блізкія. У Ц.р. укараненння атамы аднаго элемента размяшчаюцца ў міжвузліях крышт. рашоткі другога элемента; утвараюцца, калі памеры атамаў кампанентаў значна адрозніваюцца. Ц.р. адымання — частка атамаў у падрашотцы аднаго элемента адсутнічае (узнікаюць *вакансіі*). Да Ц.р. належаць многія *мінералы, сплавы, паўправадніковыя матэрыялы, дыэлектрыкі*, магн. матэрыялы, большасць відаў *шкла* і інш. У прам-сці Ц.р. атрымліваюць крышталізацыяй з расплаваў і растворaў, кандэнсацыяй з газавай фазы ці дыфузіяй у цвёрдай фазе. Змена саставу Ц.р. дае магчымасць мяняць уласцівасці паўправадніковых матэрыялаў, іонных праваднікоў, ферытаў і інш. і т.ч. атрымліваць матэрыялы з зададзенымі ўласцівасцямі (гл. *Легіраванне*).

ЦВЁРДЫЯ СПЛА́ВЫ, кампазіцыйныя гетэрагенныя матэрыялы. Складаюцца з цвёрдых тугаплаўкіх злучэнняў (пераважна карбідаў пераходных металаў), якія размеркаваны ў пластычнай матрыцы з металаў трыяды жалеза. Напр., вальфрамкобальтавыя Ц.с. (WC—Co) — карбід вальфраму ў кобальтавай сувязнай фазе. Вызначаюцца высокай цвёрдасцю, трываласцю і інш. Вырабляюць Ц.с. метадамі *парашковай металургіі*. Выкарыстоўваюць для вырабу рэжучых інструментаў па апрацоўцы чыгуну, сталі, сплаваў, шклапластыкаў; горна-буравога і вуглездабывальнага інструменту, апаратаў, таксама зносаўстойлівых дэталей і прылад.

ЦВЁРДЫЯ ФО́РМЫ ВЕ́РША, віды вершаў з пастаяннымі вершаваным памерам, рыфмоўкай, колькасцю і размяшчэннем радкоў: *санет* і *вянок санетаў, трыялет, секстына, тэрцыны, актава, рандо, рандэль, рытурнель, глоса, газель, танка* і інш.

Узніклі пераважна ў сярэдневяковай класічнай паэзіі (італьян., франц., ісп.), потым засвоены інш. нац. л-рамі. У сусв. л-ры Ц.ф.в.

выкарыстоўвалі І.К.Ф.Гёльдэрлін, У.Шэкспір, Ф.Петрарка і інш.

У бел. паэзіі ўжываюцца з пач. 20 ст. Асабліва паспяхова іх распрацоўваў М.Багдановіч. Да іх звярталіся Я.Купала, Я.Колас, З.Бядуля, У.Дубоўка, У.Жылка, Р.Крушына, Г.Леўчык, А.Салавей і інш. Выкарыстоўваюцца некат. Ц.ф.в., характэрныя для ўсх. паэзіі: *газель* («Кактэбельская газель» С.Ліхадзіеўскага), *айрэн* («Айрэны» С.Панізніка), *рубаі* («Рубаі» Я.Янішчыц). Ужываюцца ў сучаснай бел. паэзіі (Э.Акулін, Р.Барадулін, Н.Гілевіч, Я.Сіпакаў і інш.). *В.П.Рагойша.*

ЦВІКА́Ў (Zwickau), горад на Пд Германіі, на р. Цвікаўэр-Мульдэ. 119 тыс. ж. (1992). Прам-сць: машынабудаванне (у т.л. аўтамабілебудаванне), эл.-тэхн., хім., абутковая, швейная, тэкст., вытв-сць металаканструкцый.

ЦВІКЕ́ВІЧ Аляксандр Іванавіч (22.6.1883, г. Брэст — 30.12.1937), бел. паліт. дзеяч, гісторык, філосаф, публіцыст. Брат І.І.*Цвікевіча*. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1912). Працаваў прысяжным павераным у Брэст-Літоўску і Пружанах. У час 1-й сусв. вайны ў Тульскім к-це дапамогі ахвярам вайны. У 1917 у Маскве, адзін з заснавальнікаў Бел. нар. грамады. Удзельнік Усебел. з'езда 1917 у Мінску, выканкомам якога ў студз. 1918 у складзе бел. дэлегацыі накіраваны на перагаворы па падрыхтоўцы Брэсцкага мірнага дагавора. У сувязі з тым, што паўнамоцтвы бел. дэлегацыі не прызналі ні рас., ні ням. бакі, выступіў дарадцам дэлегацыі Укр. Нар. Рэспублікі (УНР). Пазней на чале дыпламат. місіі БНР у Кіеве вёў перагаворы з урадам УНР аб аказанні БНР фін. дапамогі і ўсталяванні граніц паміж БНР і УНР. Разам з М.В.Доўнар-Запольскім паслаў ноту сав. ўраду з патрабаваннем прызнаць БНР і вызначыць граніцы з РСФСР. У Кіеве з яго дапамогай выдавалася газ. *«Белорусское эхо»*, арганізавана Бел. гандлёвая палата. У 1918 выконваў дыпламат. даручэнні ўрада БНР у Маскве, потым узначальваў дыпламат. місію БНР у Германіі. У 1921—23 міністр замежных спраў ва ўрадзе БНР, выступаў за яе міжнар. прызнанне. Быў старшынёй *Першай Усебеларускай канферэнцыі* ў Празе, на якой выказаўся за кансалідацыю бел. паліт. сіл, выступіў супраць паланафільскай арыентацыі П.Алексюка і інш. Разам з В.Ластоўскім прысутнічаў на *Генуэзскай канферэнцыі 1922*, дзе спрабаваў уключыць бел. пытанне ў парадак дня яе работы. Прызнаў Вільню сталіцай Літвы, выказаў згоду на ўключэнне Віленшчыны і Гродзеншчыны ў склад Літ. Рэспублікі, што прывяло да ўрадавага крызісу БНР. З 1923 прэм'ер-міністр БНР у Празе. Пад уздзеяннем палітыкі *беларусізацыі*, якая праводзілася ў БССР, стаў прыхільна ставіцца да Сав. Беларусі і прыйшоў да высновы аб спыненні дзейнасці ўрада БНР, прызнанні Мінска адзіным цэнтрам нац.-дзярж. адраджэння Беларусі, што і зафіксавала скліканая і праведзеная па яго ініцыятыве *Другая Усебеларуская канферэнцыя* ў Берліне. Пасля канферэнцыі пераехаў у Мінск, працаваў кансультантам у Наркамаце фінансаў, вучоным сакратаром Інбелкульта. З 1929 у Ін-це гісторыі Бел. АН. 14.7.1930 арыштаваны па т.зв. справе *«Саюза вызвалення Беларусі»*, сасланы на 5 гадоў у г. Перм. У 1935 тэрмін ссылкі падоўжаны на 2 гады. У 1937 зноў арыштаваны, 17.12.1937 прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны ў Мінску. Рэабілітаваны ў 1988—89. Даследаваў праблемы нац.-дэмакр. адраджэння, фарміравання грамадска-паліт. думкі на Беларусі, станаўлення самасвядомасці і развіцця дзяржаўнасці бел. народа. Яго навук. і публіцыст. спадчына яшчэ не вывучана і дакладна не ідэнтыфікавана. Выступаў у друку пад псеўд. Алесь Галынец, Аляксандр Незалежны, А.Ц. Аўтар прац «Кароткі нарыс узнікнення Беларускай Народнай Рэспублікі» (1918), «Беларусь: Палітычны нарыс» (1919, 2-е выд. 1990), кнігі «Адраджэнне Беларусі і Польшча» (1921). У 1922 у час. «Беларускі сцяг» надрукаваў аналітычныя эсэ «Да пытання аб незалежнасці Беларусі», «Незалежнасць як праграма сённяшняга дня», філас. эцюд да 4-х угодкаў абвяшчэння БНР, арт. «Беларусь перад Генуэзскай канферэнцыяй», «Эўразійцы», манаграфічную працу «Погляд П.Бяссонава на беларускую справу». Найб. значная кніга Ц. «Западно-русизм»: Нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст.» (1929, 2-е выд. 1993) прысвечана гісторыі ўзнікнення, афармлення як сістэмы поглядаў і асобнай школы, інспіраванай царскімі ўладамі грамадскай плыні *«заходнерусізм»*.

А.І.Цвікевіч.

В.К.Цвірка.

Тв.: Вялікае апрашэнъне ці Вялікае ўдасканаленъне? Рыга, 1926.

Літ.: Ліс А. Паланёны далёкай марай // Ліс А. Цяжкая дарога свабоды. Мн.,1994.

А.С.Ліс, У.М.Міхнюк.

ЦВІКЕ́ВІЧ Іван Іванавіч (ліст. 1891, г. Брэст — 1.7.1938), бел. дзеяч навукі і культуры. Брат А.І.*Цвікевіча*. Скончыў мед. ф-т Варшаўскага ун-та (1914). У часы 1-й сусв. і грамадз. войнаў ваен. ўрач. З канца 1917 у Маскве, працаваў урачом і ў Наркамаце асветы РСФСР. З 1918 ваен. ўрач у Чырв. Арміі, у 1920 дывізія, дзе ён служыў, інтэрніравана ў Германіі. З сярэдзіны 1921 у гандл. прадстаўніцтве і замежным аддзеле Дзяржвыдавецтва РСФСР у Берліне. З мая 1923 у Мінску ў Белдзяржвыдавецтве, адначасова чл. калегіі Наркамата аховы здароўя БССР. Быў правадз. членам Інбелкульта і старшынёй яго мед. камісіі. Аўтар біягр. нарыса пра К.Каліноўскага («Полымя». 1924. № 2), навук.-папулярных брашур і артыкулаў па мед. тэматыцы, падручніка для сярэдніх школ «Анатомія, фізіялогія і гігіена» (3-е выд. 1930). Перакладаў на бел. мову творы Р.Тагора. 18.7.1930 арыштаваны па т. зв. справе *«Саюза вызвалення Беларусі»*, абвінавачаны ў прыналежнасці да арг-цыі «Беларускае брацтва». 10.4.1931 асуджаны на 5 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Пакаранне адбываў у Нарымскім краі, потым працаваў у Алтайскім краі. 22.8.1937 зноў арыштаваны, прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны ў 1960.

У.М.Міхнюк.

ЦВІ́НГЕЛЬ Яўген Рыгоравіч (н. 27.3.1938, г. Бабруйск Магілёўскай вобл.), бел. архітэктар. Засл. архітэктар Беларусі (1998). Скончыў Мінскі арх.-буд. тэхнікум (1957), Бел. тэатр.-маст. ін-т (1970). З 1965 працуе ў ін-це Белдзіпрагандаль (гал. архітэктар праектаў). Асн. работы: у Мінску — гандл. комплексы з-даў «Гарызонт» (1979, у сааўт.), «Ударнік» (1985), універсамы «Гродна» (1982), «Трактаразаводскі» (1986), ф-ка паўфабрыкатаў (1994); універмагі «Вілія» ў г. Вілейка (1988) і ў г. Смаргонь (1989), ф-кі паўфабрыкатаў у гарадах Светлагорск (1992) і Смаргонь (1993), гандл. цэнтры ў саўгасах «Новае Палессе» (Мінскі р-н, 1998), «Іскра» (Лагойскі р-н), «Крыніца» (Капыльскі р-н, абодва 1999) і інш. У 1975—85 ажыццявіў пераабсталяванне 50 рабочых сталовых з установкай лініі «Эфект» (аўтар вынаходніцтва — Ц., Залаты медаль ВДНГ СССР). Удзельнічаў у рэканструкцыі Дома афіцэраў у Мінску (1982, у сааўт.).

ЦВІ́НГЛІ (Zwingli) Ульрых (Хульдрэйх; 1.1.1484, Вільдхаўз, Швейцарыя — 11.10.1531), швейцарскі тэолаг, царк. рэфарматар і паліт. дзеяч; стваральнік *цвінгліянства*. Вучыўся на філас. ф-це Венскага ун-та (1500—03), вывучаў тэалогію ў Базельскім ун-це (з 1504 бакалаўр, з 1506 магістр). З 1506 святар; служыў парафіяльным святаром у Гларусе (1506—16), Айнзідэльне (1516—19), з 1519 канонік цюрыхскага сабора Гросмюнстэр. Знаёмства з творамі *Эразма Ратэрдамскага* падштурхнула яго да паглыбленага вывучэння Новага запавету і творыў айцоў царквы. У трактаце «Пра яснасць і верагоднасць слова Божага» (1521) апісаў свой паступовы паварот ад філасофіі і тэалогіі да Біблії. У 1522 ён распачаў цюрыхскую Рэфармацыю: распрацаваў стройную сістэму рэформы царквы і паліт. ладу, паклаўшы ў аснову

абнаўлення хрысціянства Свяшчэннае пісанне. Ц. адкінуў неабходнасць пасрэдніцтва каталіцкай іерархіі, пакланенне абразам і мошчам святых, паствы, манаства, цэлібат, пышнасць каталіцкага культу і інш. Ц. адкрыта парваў з рым. папам, пазней адмовіўся ад сану святара і ўзяў шлюб. Сваю пазіцыю ён выклаў у «67 тэзісах» (1522), якія ляглі ў аснову яго вучэння — цвінгліянства. На цюрыхскіх дыспутах 1523 ён перамог католікаў і з таго часу ўзначаліў Рэфармацыю ў Цюрыху: зачынены кляштары, з касцёлаў выдалены жывапіс і музыка, адменена імша. Ц. пераклаў Біблію на швейц. дыялект ням. мовы і выклаў рэфарматарскае веравучэнне ў кнізе «Каментарый пра сапраўдную і несапраўдную рэлігію» (1525). Цвінгліянства перамагло таксама ў Берне, Базелі, Гларусе і інш. гарадах, якія разам з Цюрыхам аб'ядналіся ў саюз евангелічных кантонаў. У ваен. сутыкненнях з каталіцкімі ляснымі кантонамі цюрыхскае войска было разбіта, сам Ц., які знаходзіўся пры ім у якасці прапаведніка, загінуў у бітве пры Капелі.

Н.К.Мазоўка.

У.Цвінглі. Мастак Г.Аспер. 16 ст.

ЦВІНГЛІЯ́НСТВА, пратэстанцкае вучэнне, сфармуляванае ў працах У.*Цвінглі* і пашыранае ў Швейцарыі і паўд. Германіі ў 16 ст. У адрозненне ад інш. пратэстанцкіх вучэнняў Ц. сфарміравалася без непасрэднай сувязі з *лютэранствам*. Ідэалаг. аснова Ц. — хрыстацэнтрычны паўлінізм (выкладзенае ў пасланнях апостала Паўла вучэнне аб тым, што першародны грэх чалавека збаўлены ахвярай Хрыста і што боская ласка даруе чалавеку выратаванне праз веру). Ц. прызнае сапраўдным толькі тое, што непасрэдна пацвярджаецца Свяшчэнным пісаннем, фактычна адмаўляе таінствы і ўспрымае іх толькі як сімвалы. Паводле Ц., усё, што адцягвае ўвагу ад самапаглыблення і разлічана на пачуццёвае ўспрыняцце (жывапіс, музыка), павінна быць выдалена з храма. Гібель Цвінглі і паражэнне цюрыхскага войска прывялі да выцяснення Ц. з Швейцарыі. Аднак намаганнямі пераемніка Цвінглі Г.Булінгера яно зноў пачало пашырацца. У канцы 16 — пач. 17 ст. Ц. зліўся з *кальвінізмам*.

Н.К.Мазоўка.

ЦВІНТА́Р (ад польск. cmentarz могілкі), царкоўны двор ці агароджанае месца пры царкве. Часам Ц. наз. агароджаныя могілкі пры царкве.

ЦВІНТАРЭ́Й (Centaurium), род кветкавых раслін сям. гарычкавых. Каля 50 відаў. Пашыраны ў нетрапічных паясах.

Цвінтарэй: 1 — звычайны; 2 — прыгожы.

На Беларусі 3 віды Ц.: балотны (C. uliginosum), звычайны, нар. назвы сардэчнік, цэнтаўрыя; тысячнік (C. erythraea); прыгожы (C. pulchellum). Трапляюцца на сухадольных і вільготных лугах, узлесках, сярод хмызнякоў.

Адна-, двух- і шматгадовыя травяністыя расліны выш. 5—35 см. Сцёблы голыя, радзей укрытыя кароткімі сасочкамі. Лісце супраціўнае, суцэльнакрайняе. Кветкі ружовыя або белыя, сабраны ў вілавата-разгалінаванае, зрэдку ў коласападобнае суквецце, часам адзіночныя. Плод — каробачка. Лек. расліны.

Дз.І.Трацяк оў.

ЦВІ́РКА Віталь Канстанцінавіч (14.2.1913, в. Радзеева Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл. — 11.6.1993), бел. жывапісец, педагог. Нар. маст. Беларусі (1963). Скончыў Віцебскі маст. тэхнікум (1932), Маскоўскі маст. ін-т імя В.Сурыкава (1942). З 1947 выкладаў у Мінскім маст. вучылішчы, з 1952 у Бел. тэатр.-маст. ін-це (у 1958—60 рэктар). У 1962—63 старшыня праўлення Саюза мастакоў Беларусі. Пісаў пераважна пейзажы, якія вызначаюцца абагульненасцю, арганічным адзінствам паэт. пачуцця з манум. шырынёй і велічнасцю вобразаў бел. прыроды. Панарамнасцю кампазіцыі, эпічнасцю, шырокай жывапіснай манерай і тонкім каларытам вылучаюцца творы: «Беларускі пейзаж» (1951, 1955, 1956), «Лагойск», «Возера Сялява» (абодва 1952), «Хата рыбака», «Возера Нарач» (абодва 1956), сюіта «Поры года» (1958), «Лагойскі сказ» (1960), «Мая радзіма» (1961), «Нёман», «Пачатак сакавіка» (абодва 1962), «Вялікая вада» (1965), «Беларускі матыў» (1967) «На Нёмане» (1969), «Збожжа ўбрана» (1972), «Бацькаўшчына Я.Коласа», «Зямля Я.Купалы» (абодва 1982), «Зімка» (1984), серыя «На зямлі беларускай» (1963—66). Лірычнасць інтанацый і задушэўнасць у перадачы станаў прыроды, камернасць матываў уласцівы карцінам «Зіма. Ускраіна старога Мінска» (1945), «Сакавік», «Сакавік. Халодны дзень» (абедзве 1947), «Каля млына» (1954), «Поўдзень» (1956), «Беларускі краявід» (1974), «Мой край родны» (1968), трыпціх «На зямлі беларускай» (1961). Аўтар серыі мемарыяльных гар. пейзажаў, звязаных з падзеямі Вял. Айч. вайны, індустр.

В.**Цвірка**. Мой край родны. 1968.

пейзажаў, нацюрмортаў. Дзярж. прэмія Беларусі 1967. Іл. гл. таксама да арт. *Жывапіс, Пейзаж.*

Літ.: Заславская О. В.К.Цвирко. М., 1960; Крейчак Б. В.Цвирко. Мн., 1985.

В.Я.Буйвал.

К.Цвірка.

ЦВІ́РКА Кастусь (Канстанцін Аляксеевіч; н. 28.3.1934, в. Зялёная Дуброва Старадарожскага р-на Мінскай вобл.), бел. паэт, перакладчык, фалькларыст, этнограф. Канд. гіст. н. (1972). Скончыў БДУ (1958). Настаўнічаў, працаваў у друку, на Бел. радыё. З 1965 ва Упраўленні па распаўсюджанні друку Мін-ва сувязі Беларусі, у Рэсп. доме нар. творчасці. З 1972 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, з 1982 у выд-ве «Юнацтва», з 1984 у час. «Полымя» (заг. аддзела). З 1996 кіраўнік і гал. рэдактар выд-ва «Беларускі кнігазбор» і гал. рэдактар выд-ва «Белліт-фонд». Друкуецца з 1951. У паэт. зб-ках «Такія сэрцы ў нас» (1959), «Бягуць раўчукі» (1962), «Чарназём» (1967), «Каласы» (1975), «Сцежка дадому» (1980), «Хат вячысты дар» (1982), «Лодка долі тваёй» (1988) і інш. духоўнае вяртанне да вытокаў, зварот да гіст. тэматыкі, праблемы сучаснасці. Яго творам уласцівы рэаліст.-канкрэтная вобразнасць, пранікнёная элегічнасць, шчырасць. Аўтар кн. «Слова пра Сыракомлю: Быт і культура беларусаў у творчасці «вясковага лірніка», 1975), «Беларуская фальклярыстыка: Эпоха феадалізму» (1989, з Г.А.Каханоўскім, Л.А.Малаш), артыкулаў па пытаннях л-ры, этнаграфіі і фальклору. Складальнік, аўтар уступных артыкулаў і каментарыяў да кніг «Вяселле: Абрад» (1978, у серыі «Беларуская народная творчасць»), «Выбраныя творы» Я.Чачота (1996), «Філаматы і філарэты» (1998), хрэстаматыі «Літаратура Беларусі: Першая палова XIX ст.» (2000) і інш. Піша для дзяцей: кн. вершаў і казак «Як Алесь згубіўся ў лесе» (1986), «Добрыя суседзі» (1988), і інш. Перакладае на бел. мову польскамоўныя творы ўраджэнцаў Беларусі, а таксама з англ., груз., рус., укр. моў. Асобным выданнем выйшлі ў яго перакладзе «Дзяды» А.Міцкевіча (2001). Некат. вершы К. пакладзены на музыку бел. кампазітарамі.

Тв.: Бацькаў свет палявы: Выбр. вершы і паэмы. Мн., 1994; Той курган векавечны...: Сцяжыны вандровак. Мн., 1985; Лісце забытых алеяў: Эсэ. Мн., 1993.

Л.М.Гарэлік.

ЦВІ́РКА Міхаіл Паўлавіч (н. 25.7.1945, в. Грэск Слуцкага р-на Мінскай вобл.), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1989), праф. (1990). Скончыў БДУ (1969). З 1968 у Ін-це фізікі АН Беларусі, з 1975 у НДІ прыкладных фіз. праблем БДУ, з 1997 у Нац. н.-д. цэнтры маніторынгу азанасферы БДУ (нам. дырэктара). Навук. працы па фотафізіцы і фотахіміі біямалекул і комплексных злучэнняў рэдказямельных элементаў, маніторынгу сонечнага прыземнага ультрафіялетавага выпрамянення. Выявіў схему працэсаў пераўтварэння светлавой энергіі ў малекулах хларафілу і роднасных злучэнняў, распрацаваў новыя метады спектральнага аналізу.

Тв.: Спектроскопия и квантовая химия порфиринов (разам з В.А.Кузьміцкім, К.М.Салаўёвым) // Порфирины: Спектроскопия, электрохимия, применение. М., 1987; Фотофизика комплексных соединений редкоземельных элементов (разам з В.Я.Венчыкавым, А.Г.Светашавым) // Выбраныя навуковыя працы. БДУ. Мн., 2001. Т. 4. Фізіка.

ЦВІ́РКА (Cvirka) Пятрас (12.3.1909, в. Клангяй Каўнаскага пав., Літва — 2.5.1947), літоўскі пісьменнік. Вучыўся ў Каўнаскім маст. вучылішчы (1926—30). Друкаваўся з 1924. Першы зб. вершаў «Першая імша» (1928). Сатыр. раман «Франк Крук» (т. 1—2, 1934) і раман «Зямля-карміцелька» (1935) пра літ. сялянства, раман «Майстар і сыны» (1936) пра нар. таленты. Аўтар зб-каў апавяданняў «Захад сонца ў Нікскай воласці» (1930), «Будзённыя гісторыі» (1938), «Караючая рука» (1942), «Апавяданні пра акупантаў» (1943), «Карані дуба» (1945), «Зерні братэрства» (1947), зб. нарысаў, памфлетаў і інш. Пісаў для дзяцей: зб-кі апавяданняў «Цукровыя баранчыкі» (1935), казак «Сярэбраная куля» (1943), «Казкі Нёманскага краю» (1948). Быў знаёмы з Я.Купалам, Я.Коласам, М.Лыньковым, П.Броўкам, М.Танкам, Ц.Сяргейчыкам. На бел. мову яго асобныя творы пераклалі Я.Войніч, В.Жуковіч.

Тв.: Бел. пер.—Літоўскія апавяданні. Мн., 1957; Цудоўная крыніца: Літоўскія казкі. Мн., 1955; Салавейка. Мн., 1974; Рус. пер.— Собр. соч. Т. 1—3. М., 1967—68; Сахарные барашки. М., 1969.

Літ.: Бровка П. Встреча с П.Цвиркой // Бровка П. Пишу о сердце человечьем... М., 1974; Лыньковў М. Сердечный привет друзьям // Збор тв. Мн., 1985. Т. 7.

ЦВІЦЕ́ННЕ, перыяд жыццядзейнасці *пакрытанасенных* (кветкавых) раслін ад залажэння ў пупышках зачаткаў кветак да засыхання калякветніка і тычынак (адцвітанне), пераломны перыяд *антагенезу*, у час якога расліны пераходзяць ад вегетатыўнага росту да генератыўнага развіцця. Асн. прызначэнне Ц. — здзяйсненне *апладнення*. Перыяд Ц. падрыхтоўваецца назапашваннем *фітагармонаў*, якія, магчыма, выклікаюць залажэнне зачаткаў кветак. Пачынаецца з паяўлення на конусе нарастання парастка вонкавых вырастаў — чашалісцікаў, потым пялёсткаў, тычынак, пладалісцікаў, унутры якіх утвараецца поласць (завязь), а ў верхняй ч. адасабляецца слупок і рыльца. Гэтыя працэсы адбываюцца ў пупышцы (бутоне). Пасля *апылення* і апладнення Ц. заканчваецца, ападаюць пялёсткі, тычынкі, слупок з рыльцам; чашачка звычайна застаецца і ахоўвае завязь, якая развіваецца і ператвараецца ў плод. Доўжыцца Ц. ад 20—25 мін (некат. гарлачыкавыя) да 70—80 сут (некат. архідныя). У аднагадовых раслін Ц. настае ў 1-ы год, у двухгадовых — на 2-і, у шматгадовых траў — на 2—5-ы, у дрэў — на 10—30-ы. Многія расліны цвітуць на працягу жыцця шматразова *(полікарпічныя расліны)*, адна-, двух- і некат. шматгадовыя (парасонавыя, пальмы, агавы) — 1 раз *(монакарпічныя расліны)*. У ходзе эвалюцыі ў раслін замацаваліся прыстасавальныя рэакцыі яравізацыі і *фотаперыядызму*, у выніку чаго Ц. прымяркоўваецца да найб. спрыяльнага сезона, а таксама разнастайныя механізмы, што забяспечваюць апыленне і апладненне. У практыцы Ц. лічыцца перыяд ад пачатку раскрыцця кветак да засыхання калякветніка.

Літ.: Терехин Э.С., Федоров Р.М. Жизнь цветка. М., 1975; Бернье Ж., Кине Ж.-М., Сакс Р. Физиология цветения: Пер. с англ. Т. 1—2. М., 1985.

«ЦВІЦЕ́ННЕ» ВАДЫ́, масавае развіццё *фітапланктону*, якое суправаджаецца зменай колеру вады, парушэннем экалагічнай раўнавагі ў водных біяцэнозах. Асн. прычыны — застой вады, зніжэнне праточнасці, засмечванне, забруджванне мінер. і арган. ўгнаеннямі, змытай глебай, некат. сінт. рэчывамі. Пагаршае кіслародны рэжым вадаёмаў і арганалептычныя якасці вады, можа выклікаць заморы рыб і інш. водных жывёл, ускладняе работу фільтраў на ачышчальных і інш. гідратэхн. збудаваннях. Папярэджваюць «Ц.»в. аэрацыяй, біял. меліярацыяй вадаёмаў, абмежаваннем паступлення ў ваду забруджвальнікаў.

«ЦВІЦЕ́ННЕ» ГЛЕ́БЫ, інтэнсіўнае развіццё мікраскапічных арганізмаў (пераважна водарасцей) на паверхні і ў верхнім слоі глебы. Змяняе колер глебы і сведчыць пра яе павышаную вільготнасць. На меліяраваных землях «Ц.» г. паказвае на неабходнасць іх гідрамеліярац. карэкціроўкі для аптымізацыі воднага рэжыму.

ЦВЫРКУНО́ВЫЯ (Grylloidea), надсямейства насякомых атр. прамакрылых. Вядомы з пач. трыясу. Больш за 2300 відаў. Пашыраны ўсюды, пераважна ў тропіках і субтропіках. Жывуць у лясах, на палях і лугах, некат. ў жылых памяшканнях і інш. На Беларусі 5 відаў Ц.: цвыркун дамавы (Gryllus, або Acheta, ці Gryllulus, domesticus), цвыркун палявы (G. campestris), мядзведка звычайная (гл. *Мядзведкі*) і інш.

Даўж. 1,6—60 мм. Цела цыліндрычнае, укрыта шаўкавістымі валаскамі і шчацінкамі. Галава авальная. Вусікі ніткападобныя. На

спіне плоскія скурыстыя надкрылы, якія ў самцоў маюць апарат цвыркання (адсюль назва). Лапкі 3-члянікавыя. Орган слыху на галёнках пярэдніх ног. У самак доўгі, коп'епадобны яйцаклад. Развіццё з няпоўным ператварэннем. Расліннаедныя, радзей сапрафіты і драпежнікі. Некат. віды — шкоднікі. Іл. гл. таксама да арт. *Мядзведкі, Прамакрылыя.*

С.Л.Максімава.



Да арт. **Цвыркуновыя**. Цвыркуны: 1 — мурашкалюб звычайны; 2 — стэпавы; 3 — сцябловы, або трубачык звычайны.

ЦВЫРКУНЫ́ (Locustella), род птушак сям. валасянкавых атр. вераб'інападобных. 9 відаў. Пашыраны ў Еўразіі, Паўн.-Зах. Афрыцы. Жывуць на вільготных лугах, берагах вадаёмаў, нізінных балотах і інш. На Беларусі 3 віды Ц.: звычайны (L. naevia), рачны (L. fluviatilis) і салаўіны (L. luscinioides), занесены ў Чырв. кнігу.

Даўж. да 19 см, маса да 20 г. Апярэнне ў асн. светла-шэрых тонаў, зрэдку з бураватай спінаю або плямамі на крылах і спіне. Цела падоўжанае, сплюшчанае з бакоў. Дзюба прамая, даволі доўгая. Нясуць 3—7 яец. Насякомаедныя. Песня нагадвае строкат насякомых (адсюль назва).

Э.Р.Самусенка.

ЦВЭЙГ (Zweig) Арнольд (10.11.1887, г. Глогаў, Польшча — 26.11.1968), нямецкі пісьменнік. Вучыўся ва ун-тах Берліна, Мюнхена, Вроцлава, Гётынгена, Ростака. Удзельнік 1-й сусв. вайны. З 1933 у эміграцыі, супрацоўнічаў у ням. антыфаш. прэсе. У 1950—53 прэзідэнт Ням. АМ. Друкаваўся з 1908. Для першых значных твораў — аповесць «Запіскі пра сям'ю Клопфер» (1911), раман «Навелы пра Клаўдзію» (1912), драма «Рытуальнае забойства ў Венгрыі» (1914) — характэрны камернасць і тонкі псіхал. аналіз. Аўтар зб-каў апавяд. «Выклікаюныя цені» (1923), «Першыя крокі» (1925), рамана «Спрэчка пра унтэра Грышу» (1927), што стаў асновай эпічнага цыкла пра 1-ю сусв. вайну «Вялікая вайна белых людзей»: раманы «Маладая жанчына 1914 года» (1931), «Выхаванне пад Вердэнам» (1935), «Узвядзенне каралЯ на трон» (1937), «Зацішша» (1954), «Час наспеў» (1957), «Лёд пайшоў» (няскончаны). У эпапеі гістарычна праўдзіва апісаны ваен. падзеі і жыццё розных слаёў грамадства, у т.л. прырода Беларусі і побыт насельніцтва ў рамане «Спрэчка пра унтэра Грышу». Нац. прэмія ГДР 1950. Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» 1958.

Тв.: Рус. пер. — Воспитание под Верденом. М., 1954; Затишье. М., 1959; Радуга. М., 1960; Спор об унтере Грише. М., 1961.

Літ.: Топер П.М. Арнольд Цвейг. М., 1960; Арнольд Цвейг: Биобиблиогр. указ. М., 1983.

У.Л.Сакалоўскі.

ЦВЭЙГ (Zweig) Стэфан (28.11.1881, Вена — 22.2.1942), аўстрыйскі пісьменнік. Вучыўся ва ун-тах Вены, Берліна. З 1934 у эміграцыі. Дэбютаваў у 1898 як паэт. Першыя зб-кі вершаў «Сярэбраныя струны» (1901) і навел «Каханне Эрыкі Эвальд» (1904) з элементамі імпрэсіянізму, сімвалізму, неарамантызму. Вядомасць прынеслі яго навелы (зб-кі «Першыя перажыванні», 1911; «Амок», 1922; «Разгубленасць пачуццяў», 1927, і інш.), у якіх адлюстраваны чалавечыя страсці і якія ўяўляюць сабой філас.-этычнае і эстэт. адзінства; яны адметныя псіхалагізмам, сюжэтным драматызмам, аўтэнтычнасцю станаў чалавека і прыроды, экспрэсіўнасцю і ўзнёсласцю мовы, стылёвай разнастайнасцю. Значнае месца ў творчасці Ц. занялі раманізаваныя біяграфіі: «Жазеф Фушэ» (1929), «Марыя Антуанета» (1932), «Марыя Сцюарт» (1935), «Магелан» (1938), «Бальзак» (апубл. 1946) і інш., цыкл эсэ «Будаўнікі свету» (1920—28; літ. партрэты Л.Талстога, Ф.Дастаеўскага, Ч.Дзікенса, Стэндаля, З.Фрэйда і інш.), біягр. эсэ пра пісьменнікаў Э.Верхарна, Р.Ралана, мастака Ф.Мазерэля і інш. Аўтар рамана «Нецярпенне сэрца» (1939), цыкла гіст. мініяцюр «Зорныя гадзіны чалавецтва» (1927, пашыранае выд. 1943), зб. нарысаў, прамоў і рэцэнзій «Сустрэчы з людзьмі, кнігамі, гарадамі» (1937), кн. ўспамінаў «Учарашні свет» (выд. 1944), драм. рэпартажаў і інш. На бел. мову асобныя яго навелы пераклаў У.Чапега.

А.Цвэйг.

С.Цвэйг.

Тв.: Бел. пер. — Пякучая таямніца. Мн., 1994; Рус. пер.— Собр. соч. Т. 1—7. М., 1963; Избр. новеллы. М., 1982; Очерки. М., 1985; Вчерашний мир. М., 1991.

Літ.: Лидин В.Г. Стефан Цвейг // Лидин В.Г. Люди и встречи. Страницы полдня. М., 1980; Стефан Цвейг: Биобиблиогр. указ. М., 1976.

Е.А.Лявонава.

ЦВЯРСКА́Я ВО́БЛАСЦЬ. Размешчана ў цэнтры еўрап. часткі Рас. Федэрацыі. Утворана 29.1.1935. Да 1990 наз. Калінінская вобл. Пл. 84,1 тыс. км^2. Нас. 1552,5 тыс. чал. (2002), гарадскога 74%. Цэнтр — г. *Цвер*. Найб. гарады: Ржэў, Вышні Валачок, Кімры, Таржок, Канакова, Балагое, Удомля.

Ц.в. займае цэнтр. ч. Усх.-Еўрапейскай раўніны. Паверхня раўнінная, з марэннымі ўзгорыстымі ўзвышшамі і зандравымі паніжэннямі. На З — Валдайскае ўзв. (выш. да 346 м), на Пд — Бельскае ўзв., на ПдЗ — Зах.-Дзвінская, на ПдУ — Прыволжская нізіны. Карысныя выкапні: буры вугаль (паўн. ч. Падмаскоўнага вугальнага бас.), торф, кварцавыя і буд. пяскі, вапнякі, даламіты, гліны, каменная соль, сапрапель; крыніцы мінер. вод. Клімат умерана кантынентальны, з халаднаватым летам і мяккай зімою. Сярэдняя т-ра студз. ад -8,8 да -10,9 °С, ліп. 16,8—17,5 °С. Ападкаў каля 650 мм за год. Больш за 800 рэк і ручаёў агульнай даўж. 17 тыс. км. Гал. рака — Волга з прытокамі Селіжараўка, Твярца, Мядзведзіца, Малога. Каля 500 азёр, пераважна ледавіковага паходжання, найб. Селігер. У межах вобласці Вышневалоцкае, ч. Вазузскага, Іванькаўскага, Рыбінскага, Угліцкага вадасховішчаў. Глебы падзолістыя, дзярнова-падзолістыя, падзолісты-глеевыя, у далінах рэк алювіяльныя. Пад лесам (елка, хвоя, бяроза, асіна,

Цвыркуны: 1 — звычайны; 2 — рачны.

дуб, ліпа) 53% тэр. Завідаўскі нац. парк, Цэнтральналясны запаведнік.

Ц.в. — індустрыяльна-агр. рэгіён Расіі. У структуры прам-сці пераважае электраэнергетыка (каля 40% кошту вырабляемай прадукцыі) і машынабудаванне (20%). Вытв-сць электраэнергіі 22,3 млрд. кВт·гадз (2000). Канакоўская ДРЭС, Іванькаўская ГЭС, Калінінская АЭС. Здабыча бурага вугалю, торфу. Вытв-сць экскаватараў (50% вытв-сці Расіі), пасаж. вагонаў ($^3/_4$), верталётаў, кампрэсараў, станкоў для тэкст., хім. прам-сці і аўтамыйнага абсталявання, ільноўборачнай тэхнікі, пажарных машын. Развіта хім. (шклапластык, валокны, паліграф. фарбы, штучная скура, гума), лясная, дрэваапр. і цэлюлозна-папяровая, лёгкая (ільняныя, баваўняныя, шарсцяныя і шаўковыя тканіны, трыкатаж, абутак), паліграф., харч. (мукамольная, сыраробная, малочна-кансервавая) прам-сць. Вытв-сць буд. матэрыялаў. Традыц. галіна — вытв-сць вырабаў са шкла, фарфору і фаянсу (найб. з-д у Расіі ў г. Канакова). Нар. промыслы (гліняныя і драўляныя цацкі, карункапляценне, залатое шыццё). Вядучая галіна сельскай гаспадаркі — малочна-мясная жывёлагадоўля. Развіты свіна-, птушка-, коне- і авечкагадоўля (раманаўская парода). Раслінаводства спецыялізуецца на вырошчванні лёну-даўгунцу (20% ільновалакна Расіі), збожжавых (жыта, авёс, пшаніца), бульбы, агародніны, кармавых культур. Паляванне. Рыбалоўства. Даўж. чыгунак 2678 км, аўтадарог з цвёрдым пакрыццём 16 032 км, суднаходных шляхоў 924 км. Гал. чыгункі Масква—С.-Пецярбург, Масква—Рыга, Рыбінск—Балагое—Пскоў—Рыга. Суднаходства па р. Волга, воз. Селігер, вадасховішчах. Буйны порт — Цвер. Газаправоды Серпухаў—Таржок—С.-Пецярбург, Вуктыл—Таржок, нафтаправод Сургут—Таржок—Полацк. Міжнар. аэрапорт Мігалава. Бальнеалагічны курорт Кашын.

В.М.Корзун.

ЦВЯРСКО́Е КНЯ́СТВА, Цвярское вялікае княства, феадальная дзяржава ў бас. верхняй Волгі, з цэнтрам у г. *Цвер* у 1247—1485. Узнікла на землях смаленскіх *крывічоў* як удзел Пераяслаўль-Залескага княства. Дынастыю цвярскіх князёў (з сярэдзіны 14 ст. мелі тытул «вялікіх князёў») пачаў брат *Аляксандра Неўскага* Яраслаў Яраславіч [1247—71]; з 1264 ён адначасова вял. кн. уладзімірскі. Росту эканам. магутнасці Ц.к. спрыяла яго знаходжанне на водных шляхах міжнар. гандлю, якія злучалі Зах. і Паўн. Еўропу з Азіяй. Цвер была гал. сапернікам Масквы ў барацьбе за паліт. панаванне ў Паўн.-Усх. Русі, якое да канца 14 ст. асацыіравалася з валоданнем прастолам Уладзімірскага вял. княства. Некаторыя цвярскія князі былі адначасова і вял. ўладзімірскімі: у 1305—17 *Міхаіл Яраславіч* [1285—1318], у 1322—25 Дзмітрый Міхайлавіч Грозныя Вочы [1318—25], у 1325—27 Аляксандр Міхайлавіч [1325—27, 1337—39]. Паліт. і эканам. магутнасць княства была надоўга падарвана спусташальным нашэсцем ардынскіх і маскоўскіх войск, якія жорстка падавілі стыхійнае антыардынскае паўстанне цверычаў (1327). У 2-й пал. 14 ст. ў складзе Ц.к. з'явіліся ўдзельныя княствы Кашынскае, Холмскае і інш. У войнах супраць *Маскоўскага вялікага княства* Ц.к. часта карысталася падтрымкай ВКЛ (напр., *паходы Альгерда на Маскву 1368—72*), часта ваявала і з ВКЛ. Цвярскія князі падтрымлівалі з вял. князямі ВКЛ шлюбныя адносіны (напр., цвярская княжна Ульяна была жонкай *Альгерда*). Кн. *Міхаіл Аляксандравіч* [1365—99] у 1370—71 і 1375 атрымліваў у Ардзе ярлыкі на Уладзімірскае вял. княжанне, але рэальна ім не валодаў. Кн. Барыс Аляксандравіч [1425—61] дапамог маскоўскаму кн. *Васілю II* перамагчы ў *Феадальнай вайне* 1425—53. Невыкананне ВКЛ саюзных дагавораў 1449 і 1484 дазволіла маскоўскаму вял. кн. *Івану III* скінуць апошняга цвярскога князя *Міхаіла Барысавіча* [1461—85] і далучыць Ц.к. да сваіх уладанняў.

Літ.: Черепнин Л.В. Образование Русского централизованного государства в XIV—XV вв. М., 1960; Кучкин В.А. Повести о Михаиле Тверском. М., 1974; Клюг Э. Княжество Тверское (1247—1485 гг.): Пер. с нем. Тверь, 1994.

М.Г.Нікіцін.

ЦВЯТА́ЕВА Марына Іванаўна (8.10.1892, Масква — 31.8.1941), руская паэтэса. З 1922 у эміграцыі (Прага, Парыж і інш.). У 1939 вярнулася на радзіму. У Вял. Айч. вайну ў эвакуацыі ў г. Елабуга, скончыла жыццё самагубствам. Першы зб. вершаў — «Вечаровы альбом» (1910). У вершах 1912—15 (кнігі «Чароўны ліхтар», 1912; «З дзвюх кніг», 1913, і «Юнацкія вершы», не апубл.) дзённікавая паслядоўнасць, паэтызацыя гераічнага, свядомае адмаўленне ад шэрасці паўсядзённага побыту. У зб-ках вершаў «Вёрсты» (1921), «Вёрсты. Вершы. Вып. 1» (1922), «Рамяство» (1923), «Пасля Расіі, 1922—1925» (1928); у «Паэме Гары» і «Паэме Канца» (абедзве 1926) філас. глыбіня, міфатворчасць, тэмы Расіі, паэзіі, кахання, выкарыстанне фальклору, гар. «жорсткага» раманса. Кн. вершаў «Лебядзіны стан» (1917—20, у Расіі апубл. 1991) напоўнена евангельскімі вобразамі. У паэмах-казках «Цар-Дзяўчына» (1922) і «Маладзец» (1924), у кн. лірычнай сатыры «Пацукалоў» (1925), у драмах «Фенікс» (1924), «Арыядна» (нап. 1924, апубл. пад назвай «Тэзей», 1927), «Федра» (1928) зварот да архетыпаў, вобразаў і сюжэтаў з розных эпох і культ. пластоў. Паэзія Ц. адметная інтанацыйна-рытмічнай экспрэсіўнасцю верша, смелай метафарычнасцю, складанай і багатай паэт. інструментоўкай, музычнасцю. Аўтар эсэ «Эпас і лірыка сучаснай Расіі» (1932, пра Б.Пастарнака і У.Маякоўскага), «Жывое пра жывое» (1933, пра М.Валошына), «Мой Пушкін» (1937) і інш. Некат. вершы Ц. пакладзены на музыку. На бел. мову асобныя яе творы пераклалі В.Аколава, Л.Хейдарава.

Тв.: Соч. Т. 1—2. Мн., 1989; Собр. соч. Т. 1—7. М., 1994—95; Избр. произв. Мн., 1984; Лирика. Мн., 2001; Бел. пер. — Дзве песні: Лірыка. Мн., 1994.

Літ.: Цветаева А.И. Воспоминания. 3 изд. М., 1983; Швейцер В.А. Быт и бытие Марины Цветаевой. М., 1992; Саакянц А.А. Марина Цветаева: Жизнь и творчество. М., 1999; Маслова В.А. Марина Цветаева: Над временем и тяготением. Мн., 2000.

А.В.Спрынчан.

ЦВЯТКО́Ў Васіль Аляксеевіч (8.4.1866, г. Самара, Расія — 1933), расійскі спявак (бас), педагог. Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1892). У 1892—1904 саліст Вял. т-ра ў Маскве. Сярод

партый: Млынар («Русалка» А.Даргамыжскага), Грэмін («Яўген Анегін» П.Чайкоўскага), Канчак («Князь Ігар» А.Барадзіна) і інш. Праф. Кіеўскай (1913—25), Адэскай (з 1929), Маскоўскай (з 1932) кансерваторый. У 1925—28 кіраваў вакальным класам у Бел. дзярж. муз. тэхнікуме. Паставіў (з І.Гіттарцам) са студэнтамі на сцэне БДТ-1 «Фауст» Ш.Гуно (1928). Сярод вучняў Л.*Александроўская*, І.*Балоцін*, С.*Друкер*.

Літ.: Ивашков Л.П. Педагогическая деятельность профессора Цветкова В.А. в Минском музыкальном техникуме // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1984. Вып. 3; Яго ж. Ля вытокаў беларускага опернага мастацтва // Мастацтва Беларусі. 1984. № 2. *Л.П.Івашкоў.*

М.І.Цвятаева.

Ю.М.Цвяткоў.

ЦВЯТКО́Ў Віктар Дзмітрыевіч (н. 13.1.1931, в. Турок Пскоўскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне тэхн. кібернетыкі. Д-р тэхн. н. (1981), праф. (1985). Скончыў Ленінградскі політэхн. ін-т (1954). З 1962 у Цэнтр. НДІ тэхнікі кіравання (заг. лабараторыі). З 1967 у Ін-це тэхн. кібернетыкі АН Беларусі (нам. дырэктара, заг. лабараторыі). З 1986 заг. кафедры ў Бел. нац. тэхн. ун-це. Навук. працы па аўтаматызацыі праектавання ў машынабудаванні. Распрацаваў сістэмна-структурныя мадэлі, мовы апісання дэталей машын і працэсаў іх вытв-сці, метады аўтаматызаванага праектавання тэхнал. працэсаў. Дзярж. прэмія Беларусі 1978.

Тв.: Системно-структурное моделирование и автоматизация проектирования технологических процессов. Мн., 1979; Проблемноориентированные языки систем автоматизированного технологического проектирования. Мн., 1984 (разам з А.І.Пятроўскім, А.А.Талкачовым). *М.П.Савік.*

ЦВЯТКО́Ў Мікалай Іванавіч (16.12.1904, г. Магілёў — 21.1.1955), віцэ-адмірал (1951). Скончыў ваенна-марское інж. вучылішча (1929). У ВМФ з 1922. З 1930 камандзір эсмінца, лінкора, флагманскі сувязіст ваен. флатыліі і флоту. У 1938 быў рэпрэсіраваны. У 1940 нач. аддзела ўпраўлення сувязі ВМФ. У Вял. Айч. вайну кіраўнік сувязі караблёў Балт. флоту, удзельнічаў у арганізацыі сувязі ў час дэсантных аперацый у раёне Пілаў—Кёнігсберг—Данцыг. У сак.—маі 1945 нач. аддзела сувязі Балт. флоту. З 1947 нач. сувязі ВМФ СССР.

Б.Дз.Далгатовіч.

ЦВЯТКО́Ў Юрый Мікалаевіч (н. 14.2.1941, в. Дварышчы Себежскага р-на Пскоўскай вобл., Расія), бел. кінарэжысёр. Засл. дз. маст. Беларусі (1991). Скончыў Усесаюзны ін-т кінематаграфіі ў Маскве (1963). З 1963 на кінастудыі «Беларусьфільм» (у 1993—96 ген. дырэктар), у 1989—93 дырэктар Рэсп. вытв.-творчага прадпрыемства «Белвідэацэнтр». З 1996 нам. міністра культуры Рэспублікі Беларусь, з 2001 нач. Дзяржрэгістра кінавідэафільмаў і кінавідэапраграм. Зняў маст. фільмы «Іду шукаць» (1966, з І.Рамішэўскім), «Анюціна дарога» (1968). Рэжысёр дакумент. фільмаў: «Памяць каменя» (1966), «Песня Палесся» (1968), «Хутка і чаго б гэта ні каштавала» (1980), «Пад чужым імем» (1981), «50-ы сезон» (1983), «Сустрэча, якая вызначыла лёс» (1985), «Чырвоны гваздзік» (1986), «Кадыш» (1993; дыплом і прыз Міжнар. кінафестывалю ў Іерусаліме 1994), «Чарнобыль і Беларусь» (1994; прыз Міжнар. кінафестывалю ў г. Эбензе, Аўстрыя, 1995); цыклаў дакумент. гіст.-рэв. фільмаў: «Гісторыя адной тэлеграмы», «Чарвякову... тэрмінова... Ленін» (абодва 1982), «Мост» (1983), «Рэвалюцыя дае нам права...» (1985), дакумент. фільмаў пра выдатных асоб Беларусі: «Цішка Гартны» (1988), «Быў. Ёсць. Буду — У.Караткевіч» (1989), «Алесь Гарун» (1990), «Кінарэжысёр Віктар Тураў» (1995, дыплом Міжнар. кінафестывалю «Залаты вішзь» 1996). Рэжысёр-пастаноўшчык маст. тэлефільмаў «Спяшайся будаваць дом» (1970), «Веснавая казка» (1971), «Пасля кірмашу» (1972), «Гэта вясёлая планета» (1973; гал. прыз Маскоўскага фестывалю тэлефільмаў 1973), «Ясь і Яніна» (1974), «Леташняя кадрыля» (1978), маст. кінафільма «Марынка, Янка і таямніцы каралеўскага замка» (1978). Дзярж. прэмія Беларусі 1986. *Г.У.Шур.*

ЦВЯТНА́Я КАПУ́СТА, гл. ў арт. *Капуста*.

ЦЕ́КАННЕ, фанетычная з'ява, звязаная з пераходам гука «т» пры яго памякчэнні ў мяккую афрыкату «ц'». Напр., «ціхі», «на дроце», «мяту — мяці», «ты — цябе», «куст — кусцік», «несці», «лацінскі», «бацвінне». Уласціва бел. мове і некат. дыялектам рус. мовы. Бел. Ц. адлюстроўваецца ў пісьмовых помніках з 15 ст. Пашырана на ўсёй этн. тэр. беларусаў, што сведчыць на карысць гіпотэзы пра яго самаст. развіццё. Я.Ф.Карскі тлумачыў паходжанне Ц. (як і *дзекання*) празмерным змякчэннем зубных гукаў «т» і «д», якія пачалі вымаўляцца са свісцячым адценнем, уласцівым гукам «с» і «з», што і прывяло да ўзнікнення мяккіх афрыкат «ц'» і «дз'».

Літ.: Юргелевіч П.Я. Курс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі. Мн., 1974. *А.Я.Міхневіч.*

ЦЕ́ЛА геаметрычнае, кожная абмежаваная частка прасторы разам з яе мяжой (напр., шар, прызма).

ЦЕ́ЛЕШ Вячаслаў Міхайлавіч (н. 25.9.1938, г.п. Краснасельскі Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. мастак, краязнавец, філакартыст. Скончыў Латвійскую АМ (1975). Жыве ў Рызе. Дырэктар прыватнай бел. школы ў Рызе. Старшыня суполкі мастакоў-беларусаў Балтыі «*Маю гонар*», нам. старшыні т-ва бел. культуры «Світанак». Працуе ў розных жанрах станковага жывапісу і графікі, а таксама ў экслібрысе. Творы вылучаюцца пластычнай выверанасцю і цэльнасцю прасторавых суадносін усіх элементаў кампазіцыі. Значная роля належыць малюнку, які акрэслівае кампазіцыю, вызначае рытміку колеравых спалучэнняў. Сярод жывапісных работ: «Рыга. Парк «Аркадзія» (1975), «Нацюрморт з ручніком» (1977), «Начное дзяжурства» (1978), «Прысвячэнне зубру» (1980), «Першаму беларускаму драматургу прысвячаецца (В.Дунін-Марцінкевіч)» (1983), «Мой мацярык Віцебшчына (паэт С.Панізнік)» (1986), «У лекарскіх навуках доктар Ф.Скарына» (1990), «Заміж персідскага ўзору... (М.Багдановіч у Вільні)» (1991), «Дзвіна-Даўгава — маці наша (Я.Купала і Я.Райніс)» (1992), «Скарына ў Рызе» (1993), партрэты бацькі (1973), сястры Веры (1979), П.Сокала (Масальскага; 1980), жонкі (1992). Выканаў графічныя цыклы «У цені часу трыумфаў» (1982—92), «Касмічныя шляхі» (1983—87), партрэты Т.Залькалнса (1981), А.Мальдзіса (1982), «Прысвячэнне бацьку латышскага тэатра А.Алунану» (1984), «Аўтапартрэт» (1985), ліст «Горад» (1992) і інш. Аўтар тэкстаў і складальнік кніг «Мінск на старых паштоўках» (1984), «Рыга на старых паштоўках» (1991), «Гарады Беларусі на Старых паштоўках» (2-е выд., 2001).

Л.Ф.Салавей.

В.Целеш. Скарына ў Рызе. 1993.

ЦЕ́ЛЕШАЎ Андрэй Рыгоравіч (1906, в. Калясянка Чавускага р-на Магілёўскай вобл. — 14.2.1940), Герой Сав. Саюза (1940). Скончыў Маскоўскае ваен. пях. вучылішча (1934). У Чырв. Арміі з 1932. Удзельнік сав.-фінл. вайны 1939—40. Камандзір матарызаванай роты разведбатальёна ст. лейтэнант Ц. вызначыўся ў баі на мысе Патаніелі на Ладажскім воз. ў ноч на 14.2.1940: рота пад яго камандаваннем зрабіла праходы ў драцяной загародзе, штурмам авалодала пазіцыямі ворага і здабыла каштоўныя звесткі пра яго агнявыя пункты; загінуў у гэтым баі.

А.Р.Целешаў.

Я.М.Целешаў.

ЦЕ́ЛЕШАЎ Яўген Міхайлавіч (19.4.1923, пас. Забайкал Талачынскага р-на Віцебскай вобл. — 29.3.1997), Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў Кіеўскае ваен. вучылішча сувязі (1947). У Чырв. Арміі з 1941. У Вял. Айч. вайну з 1942 на Варонежскім, 1-м Укр. франтах. Камандзір аддзялення сувязі сяржант Ц. вызначыўся ў баях на ПдЗ ад Кіева ў ноч на 24.9.1943: аддзяленне на чале з ім фарсіравала Дняпро, наладзіла сувязь з камандзірам палка, захапіла плацдарм і да падыходу падмацавання адбіла 10 контратак праціўніка. Да 1960 у Сав. Арміі.

ЦЕЛЯПНЁЎ Уладзімір Аляксандравіч (28.7.1931, г. Апочка Пскоўскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне ветэрынарнай медыцыны. Д-р вет. н. (1983), праф. (1985). Скончыў Віцебскі вет. ін-т (1954), дзе і працаваў з 1964. Навук. працы па пытаннях фізіялогіі і паталогіі стрававальнай сістэмы свіней. Распрацаваў аперацыйныя, функцыян. і біяхім. метады даследавання страўніка, падстраўнікавай залозы, печані, кішэчніка.

Тв.: Внутренние незаразные болезни сельскохозяйственных животных. М., 1991 (у сааўт.); Основные симптомы и синдромы болезней животных. Витебск, 2000.

ЦЕЛЯХА́НСКАЯ ЛЫ́ЖНАЯ ФА́БРЫКА. Створана ў г.п. *Целяханы* Іванцэвіцкага р-на Брэсцкай вобл. ў 1939 як рамонтны лесазавод. У Вял. Айч. вайну разбураны. Адноўлены ў 1944 і ўключаны ў Целяханскі райпрамкамбінат. У 1948 асвоена вытворчасць лыж, у 1962 — хакейных клюшак. З 1955 дрэваапр. камбінат, з 1964 лыжная ф-ка: У 1967—73 ф-ка рэканструявана. У 1971—1998 у Іванцэвіцкім вытворчым дрэваапрацоўчым аб'яднанні. У 1984 пабудаваны падрыхтоўчы цэх. З 2002 наз. Рэсп. унітарнае лесагасп. прадпрыемства «Целяханы». Асн. прадукцыя (2002): лыжы, хакейныя клюшкі, ложкі, рытуальныя вырабы.

ЦЕЛЯХА́НСКАЯ ФАЯ́НСАВАЯ МАНУФАКТУ́РА. Засн. кн. М.К.Агінскім каля 1775—78 у мяст. Целяханы Пінскага пав. (цяпер гар. пас. Іванцэвіцкага р-на Брэсцкай вобл.). Існавала да 1830. У 1797 наз. «Фаянсавая фабрыка сяла Целяханы», якую ўтрымліваў каморнік Слонімскага пав. Ф.Шпакоўскі. Сярод вырабаў дэкар. вазы, упрыгожаныя рэльефнымі дэкорамі і пакрытыя празрыстай паліхромнай палівай. Характэрныя дэкар. матывы — жаночыя маскі, жывёлы, кветкі, гірлянды. Выраблялі фрызы, карнізы для аздаблення камінаў і печаў, скульптуру малых форм, свечачнікі, кафлю белую і зялёную, у т.л. камплекты для камінаў, а таксама посуд «белы» і размаляваны кветкавымі букетамі чырв. колеру: талеркі, паўміскі з накрыўкамі і без іх, чайнікі, кубачкі са сподкамі, масленіцы, супніцы з накрыўкамі. Вырабы мелі пад палівай знакі «СО» або «С» бронзавага ці маліновага колераў. *М.М.Яніцкая.*

ЦЕЛЯХА́НСКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка на Беларусі ў 1940—59. Утвораны 15.1.1940 у складзе Пінскай вобл. Цэнтр — в. *Целяханы* (з 16.12.1956 гар. пасёлак). 12.10.1940 падзелены на 10 сельсаветаў. З 8.1.1954 у Брэсцкай вобл. 8.8.1959 раён скасаваны, сельсаветы перададзены ў Лагішынскі і Іванцэвіцкі р-ны.

ЦЕЛЯХА́НСКІ ШКЛОЗАВО́Д. Дзейнічаў у 1896—1915 у мяст. *Целяханы* (цяпер гар. пасёлак у Іванцэвіцкім р-не Брэсцкай вобл.). Выпускаў лямпавае шкло, хрустальны, рознакаляровы і сталовы посуд. Меў паравую машыну, 3 паравыя рухавікі, 2 лакамабілі і 2 катлы. У 1910 працаваў 471 чал.

Целяханская лыжная фабрыка. Цэх фарбавання лыж.

ЦЕЛЯХА́НСКІЯ ФАЯ́НСАВЫЯ ВЫРАБЫ, мастацкія вырабы канца 18 — пач. 19 ст. з г.п. Целяханы Іванцэвіцкага р-на Брэсцкай вобл. Выраблялiся на *Целяханскай фаянсавай мануфактуры.*

ЦЕЛЯХА́НЫ, гарадскі пасёлак у Іванцэвіцкім р-не Брэсцкай вобл., на *Агінскім канале*, на аўтадарозе Іванцэвічы—Пінск. За 45 км на ПдУ ад г. Іванцэвічы, 181 км ад Брэста. 4,6 тыс. ж. (2002). Прадпрыемствы лесанарыхтоўчай, дрэваапр. *(Целяханская лыжная фабрыка)* і харч. прам-сці. Санаторый «Палессе». Сярэдняя, спарт., муз. школы, школа-інтэрнат, Дом культуры, Дом дзіцячай творчасці, 2 б-кі, бальніца, паліклініка, аддз. сувязі. Брацкія могілкі сав. воінаў і партызан. Помнік партызанам. Курган памяці. Помнік гідратэхн. будаўніцтва — Агінскі канал. Помнік архітэктуры — Троіцкая царква (1934).

У пісьмовых крыніцах вядомы з 16 ст. як вёска ў Пінскім пав. Брэсцкага ваяв. ВКЛ. З 17 ст. мястэчка. Належалі князям Дольскім, Вішнявецкім, у 18 ст. — Агінскім, у 19 ст. — Пуслоўскім. Эканам. росту гандлю спрыяла буд-ва Агінскага канала, які злучыў рэкі Ясельду (прыток Прыпяці) і Шчару (прыток Нёмана) і праходзіў праз Ц. У 1778—1830 дзейнічала *Целяханская фаянсавая мануфактура* (засн. М.К.*Агінскім*) і суконная мануфактура. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у Рас. імперыі, цэнтр воласці Пінскага пав. Мінскай губ. Пасёлак моцна пацярпеў ад пажараў 1830 і 1880. У 1886 у Ц. 558 ж., 64 двары, валасная ўправа, прыстань, бровар, 2 млыны, школа кандуктараў, пач. школа, бальніца, царква, касцёл, 3 малітоўныя дамы. У 1896—1915 дзейнічаў *Целяханскі шклозавод*. У пач. 20 ст. ў Ц. каля 1000 ж., пошта, гута (471 рабочы ў 1910). З 1921 Ц. ў складзе Польшчы, мястэчка Косаўскага пав. Палескага ваяв. З 1939 у БССР, з 15.1.1940 цэнтр Целяханскага раёна Пінскай вобл.; дзейнічаў лесазавод (115 рабочых). 27.6.1941 акупіраваны нямецка-фашысцкімі, якія знішчылі ў Ц. і раёне 3226 чал. У студз. 1944 партызаны разгромілі ў Ц. нямецкі гарнізон. Вызвалены воінамі 1-га Бел. фронту ва ўзаемадзеянні з 99-й партыз. брыгадай імя Дз.Ц.Гуляева ў ходзе Беларускай аперацыі 1944. З 1954 у Брэсцкай вобл., з 6.12.1956 гар. пасёлак. З 8.8.1959 у Лагішынскім, з 25.12.1962 у Пінскім, з 6.1.1965 у Іванцэвіцкім р-нах.

ЦЕЛЯШО́ЎСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА. У Гомельскім р-не, за 2,5 км на Пд ад в. Целяшы. Створана ў 1973. Пл. 0,5 км^2, даўж. 950 м, найб. шыр. 780 м, найб. глыб. 4,1 м, аб'ём вады 1,2 млн. м^3. Абвалавана земляной дамбай даўж. 2,9 км. Наліўное: напаўняецца вадой з р. Уза па напорным трубаправодзе. Ваганні ўзроўню вады на працягу года 2,1 м. Выкарыстоўваецца для рэгулявання воднага рэжыму прылеглых зямель.

ЦЕЛЯШЫ́, вёска ў Гомельскім р-не, на р. Уза, каля аўтадарогі Гомель—Жлобін. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 34 км на ПнЗ ад Гомеля, 18 км ад чыг. ст. Уза. 622 ж., 230 двароў (2003). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Магіла ахвяр фашызму.

ЦЕ́МЕНІЦА, Цялгеніца, возера ў Лепельскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дзіва, каля в. Суша, за 30 км на ПнУ ад г. Лепель. Пл. 1,07 км², даўж. 2,21 км, найб. шыр. 870 м, найб. глыб. 20,2 м, даўж. берагавой лініі 6,2 км. Пл. вадазбору 105 км². Катлавіна падпруднага тыпу, выцягнута з Пн на Пд. Схілы катлавіны на Пн і З выш. 11—15 м, на У і Пд 6—9 м. На З і У тэраса выш. да 2 м. Берагі высокія, на Пд нізкія, пясчаныя. Мелкаводдзе пясчанае, глыбей дно сапрапелістае. Невял. востраў. Надводная расліннасць пашырана да глыб. 1,7 м, падводная — да 3 м. Злучана пратокамі з азёрамі Астраўкі і Ліпіна.

ЦЕМІРКА́НАЎ Юрый Хатуевіч (н. 10.12.1938, г. Нальчык, Кабардзіна-Балкарыя), расійскі дырыжор, педагог. Нар. арт. Кабардзіна-Балкарыі (1973). Нар. арт. Расіі (1976). Нар. арт. СССР (1981). Скончыў Ленінградскую кансерваторыю (1961, кл. альта; 1966, кл. дырыжыравання). З 1968 гал. дырыжор і маст. кіраўнік Сімф. аркестра Ленінградскай філармоніі, у 1976—86 гал. дырыжор Ленінградскага т-ра оперы і балета, з 1988 — С.-Пецярбургскага акад. сімф. аркестра. Адначасова з 1978 дырыжыраваў Лонданскім каралеўскім і Філадэльфійскім аркестрамі. У 1979—88 выкладаў у Ленінградскай кансерваторыі (з 1986 праф.). Паставіў оперы «Яўген Анегін» (1983) і «Пікавая дама» (1984) П.Чайкоўскага. Лаўрэат Усерас. конкурсу дырыжораў (1966, 1-я прэмія). Дзярж. прэмія Расіі 1971. Дзярж. прэміі СССР 1976, 1985.

Літ.: Козлов В. Ю.Темирканов: Творческий портрет. М., 1988.

ЦЕ́МНІК, военачальнік у мангола-татарскім войску, які камандаваў фарміраваннем у 10 тыс. воінаў (гл. таксама *Тумэн*). Падпарадкоўваўся *хану*.

ЦЕ́МРА, рака ў Пружанскім р-не Брэсцкай вобл., левы прыток р. Ясельда (бас. р. Прыпяць). Даўж. 20 км. Пл. вадазбору 153 км². Пачынаецца за 1 км на ПнУ ад в. Лібярполь, вусце за 0,5 км на У ад в. Труханавічы. Цячэ па Нараўска-Ясельдзінскай раўніне ў межах Ружанскай пушчы. Рэчышча каналізаванае. У вярхоўі вадасх. Лібярполь.

ЦЕ́МРАВІЧЫ, вёска ў Чавускім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 13 км на ПнЗ ад г. Чавусы, 42 км ад Магілёва, 14 км ад чыг. ст. Раста. 120 ж., 59 двароў (2003). Клуб. Брацкія магілы сав. воінаў.

ЦЕ́НГРЫ, у старажытнацюркскай рэлігіі і міфалогіі адзінае дабрадзейнае, усёведнае, правасуднае неба як неперсаніфікаваны мужчынскі боскі пачатак, які вызначае лёс чалавека, народа і дзяржавы. Пазней у міфалогіі многіх цюркамоўных і манголамоўных народаў сфарміраваліся ўяўленні пра Ц. як адзінага персаніфікаванага ўсемагутнага нябеснага бога (Ц.-хан) або як агульную назву цэлага класа нябесных багоў.

ЦЕНДРАКО́Ў Уладзімір Фёдаравіч (5.12.1923, в. Макараўская Валагодскай вобл., Расія — 3.8.1984), рускі пісьменнік. Скончыў Літ. ін-т імя М.Горкага ў Маскве (1951). Друкаваўся з 1947. У востраканфліктных аповесцях «Не да двара» (1954, фільм «Чужая радня», 1956), «Ухабы» (1956), «Тройка, сямёрка, туз» (1960), «Суд» (1961, аднайм. фільм, 1962), «Кароткае замыканне» (1962), «Тры мяшкі засмечанай пшаніцы» (1973), «Расплата» (1979), рамане «Тугі вузел» (1956, фільм «Саша ўступае ў жыццё», 1957) і інш. жыццё вёскі, духоўна-маральныя праблемы сучаснасці; у аповесцях «Цудатворная» (1958, аднайм. фільм, 1960), «Ноч пасля выпуску» (1974) складаныя праблемы выхавання. Аўтар навук.-фантаст. аповесці «Падарожжа даўжынёй у век» (1964), раманаў «Спатканне з Нефершці» (1964), «Замах на міражы» (нап. 1979—82, апубл. 1987), кн. «Плоць мастацтва» (1973), апавяданняў, п'ес, нарысаў, кінасцэнарыяў і інш. Паводле яго твораў на Беларусі пастаўлены спектаклі «Ноч пасля выпуску» (1977, Бел. т-р імя Я.Коласа, 1978, Гродзенскі абл. драм. т-р), «Тры мяшкі засмечанай пшаніцы» (1979, т-р імя Я.Коласа).

Тв.: Собр. соч. Т. 1—4. М., 1978—80.

Літ.: Клюсов Б. На передней линии: Очерк творчества Владимира Тендрякова. Мн., 1963.

ЦЕ́НІН Барыс Міхайлавіч (23.3.1905, г. Кузнецк Пензенскай вобл., Расія — 8.9.1990), расійскі акцёр. Нар. арт. Таджыкістана (1944). Нар. арт. Расіі (1950). Нар. арт. СССР (1981). Скончыў Дзярж. ін-т муз. драмы (1922). З 1922 у розных маскоўскіх т-рах. У 1937—46 у Ленінградскім т-ры камедыі, з 1962 у Маскоўскім драм. т-ры на Малой Броннай, з 1974 у Т-ры імя У.Маякоўскага. Пачынаў як вострахарактарны камед. акцёр, схільны да імправізацыі, пасля перайшоў да побытавай драмы і лірычнай камедыі: Сінічкін («Леў Гурыч Сінічкін» Дз. Ленскага ў літ. апрацоўцы А.Бондзі), сэр Тобі («Дванаццатая ноч» У.Шэкспіра), барон Кроўт («Прафесія місіс Уорэн» Б.Шоу), Чалавек будучыні («Містэрыя-Буф» У.Маякоўскага), Бацька («Маці» К.Чапека), Ён («Старамодная камедыя» А.Арбузава) і інш. З 1928 здымаўся ў кіно: «Залатыя горы», «Тайга залатая», «Новыя прыгоды Швейка», «Рускае пытанне», «Несцерка», «Расійскія яблычкі» і інш. Увасобіў вобраз камісара Мегрэ ў серыі тэлепастановак паводле раманаў Ж.Сіменона. Дзярж. прэмія СССР 1948.

Літ.: Актеры советского кино. Вып. 13. Л., 1977.

ЦЕНЦІЛО́ВІЧ Ян (?—1759), бел. скрыпач. Прыгонны М.К.Радзівіла Рыбанькі. Мяркуецца, што пачатковую муз. адукацыю атрымаў у *Нясвіжскай музычнай школе*. Удасканальваўся ў Італіі. З 1751 капельмайстар *Нясвіжскай капэлы Радзівілаў*. Лічыўся адным з лепшых музыкантаў свайго часу. *А.Л.Капілаў.*

ЦЕНЯВА́Я ЭКАНО́МІКА, вытворчасць, размеркаванне, абмен і спажыванне тавара-матэрыяльных каштоўнасцей і паслуг, утоеныя ад органаў дзярж. кіравання і грамадскасці; таксама сац.-эканам. адносіны паміж асобнымі грамадзянамі ці сац. групамі па выкарыстанні дзярж. уласнасці ў карыслівых асабістых або групавых інтарэсах. Складаецца з крымінальнай, фіктыўнай і нефармальнай эканомікі. Крымінальная ўключае «ўладкаваную» ў афіц. эканоміку злачыннасць (раскраданні, карыслівыя службовыя і гасп. злачынствы), падпольную эканам. дзейнасць, поўнасцю схаваную ад усіх форм кантролю (напр., наркабізнес, прастытуцыя), агульнакрымін. злачыннасць супраць асабістай уласнасці, грамадзян як форму пазаэканам. размеркавання даходаў (рабаванне, разбой, кража асабістай маёмасці, рэкет). Да фіктыўнай Ц.э. адносяць афіц. эканоміку, якая замест рэальных дае фіктыўныя звесткі ў сістэме ўліку і справаздачнасці. Нефармальная Ц.э. — сістэма нефармальных узаемадзеянняў паміж эканам. суб'ектамі, якая заснавана на асабістых непасрэдных кантактах і дапаўняе або замяняе афіцыйна ўстаноўлены парадак арганізацыі і рэалізацыі эканам. сувязей.

ЦЕНЯВЫ́ КАБІНЕ́Т, група дзеячаў найб. уплывовай апазіцыйнай партыі, якія з'яўляюцца кандыдатамі на асн. міністэрскія пасады ў дзярж. структуры ў выпадку прыходу партыі да ўлады. Складаецца са старшыні ўрада і міністраў. Апазіц. структура фарміруе Ц.к. са сваіх парт. функцыянераў, размяркоўвае месцы ва ўрадзе, вызначае асн. функцыі палітыка-выканаўчых роляў.

ЦЕПЛААБМЕ́Н, самаадвольны неабарачальны працэс пераносу цеплавой энергіі, абумоўлены градыентам т-ры. Выклікаецца таксама неаднароднасцямі палёў інш. фіз. велічынь, напр., градыент канцэнтрацыі выклікае дыфузійны тэрмаэфект — эфект, адваротны *тэрмадыфузіі*. Адрозніваюць *цеплаправоднасць*, канвектыўны і прамяністы Ц., Ц. пры фазавых пераўтварэннях і інш. Ц. паміж 2 цепланосьбітамі (газамі, вадкасцямі) праз цвёрдую сценку, што раздзяляе іх, наз. *цеплаперадачай*, а па-

між паверхняй цвёрдага цела і цепланосьбітам — *цеплааддачай.*

Канвектыўны Ц. — працэс Ц. ў нераўнамерна нагрэтым вадкім, газападобным ці сыпкім асяроддзі, выкліканы рухам асяроддзя ці цеплаправоднасцю. Залежыць ад фіз. уласцівасцей асяроддзя і характару яго руху. Ажыццяўляецца ў *цеплаабменніках* і цепласілавых устаноўках. Прамяністы Ц. — Ц. паміж целамі ў выніку вылучэння і паглынання імі эл.-магн. выпрамянення. Можа адбывацца пры адсутнасці прамежкавага асяроддзя паміж целамі, напр., награванне Зямлі (у т.л. яе атмасферы) паглынутым выпрамяненнем Сонца. Часта суправаджаецца канвектыўным Ц. і цеплаправоднасцю. Эфектыўны пры дастаткова высокіх т-рах цел. У тэхніцы прамяністы Ц., у т.л. інфрачырвоным выпрамяненнем, выкарыстоўваецца ў печах, сушылках, паравых катлах і інш. Ц. часта ажыццяўляецца некалькімі відамі адначасова, вызначае ці суправаджае многія працэсы ў прыродзе (напр., эвалюцыю зорак і планет, метэаралагічныя працэсы), тэхніцы і інш. У многіх выпадках разглядаецца разам з масаабменам (гл. *Цепла- і масаабмен*).

У.Л.Драгун.

ЦЕПЛААБМЕ́Н, 1) у атмасферы — абмен цеплатой, што адбываецца ў атмасферы ў гарыз. і верт. напрамках. Перанос цяпла ажыццяўляецца *канвекцыяй*, прамяністым Ц. і Ц., абумоўленым выпарэннем вады і кандэнсацыяй вадзяной пары, у нязначнай ступені малекулярнай цеплаправоднасцю. Паток цяпла накіраваны ад больш нагрэтых абласцей да менш нагрэтых; Ц. адбываецца таксама ў шыротным напрамку з прычыны неаднароднасці цеплавых уласцівасцей подсцільнай паверхні (напр., сушы і мора) і характару атм. працэсаў. У трапасферы т-ра памяншаецца ад экватара да полюсаў, а на кожнай шыраце паніжаецца з узрастаннем вышыні над узр. мора. 2) У акіяне — абмен цеплатой паміж паверхняй акіяна (мора) і атмасферай (вонкавы Ц.), паміж верхнімі і ніжнімі слаямі акіяна, а таксама паміж асобнымі раёнамі акіянаў і мораў (унутр. Ц.). Вонкавы Ц. складаецца з радыяцыйнага, турбулентнага і канвектыўнага, а таксама працэсаў выпарэння і кандэнсацыі вадзяной пары над морам; унутраны — ажыццяўляецца турбулентным і канвектыўным перамешваннем, верт. і гарыз. цячэннямі. У перыяд асенне-зімовага ахалоджвання воднай паверхні паток цеплаты накіраваны пераважна знізу ўверх, у перыяд вясенне-летняга награвання — зверху ўніз. 3) У глебе — абмен цяплом паміж паверхняй глебы і яе глыбіннымі слаямі. Звязаны з *цеплаправоднасцю*, абумоўлены рознасцю т-р розных слаёў глебы і яе *цеплаёмістасцю*. Паток цяпла летам накіраваны ў глыбіню глебы, зімой — да яе паверхні. Гл. *Цеплавы рэжым глебы.*

ЦЕПЛААБМЕ́ННІК, апарат, у якім ажыццяўляецца *цеплаабмен* паміж 2 ці больш *цепланосьбітамі*, а таксама паміж цепланосьбітам і паверхняй цвёрдага цела. Паводле прынцыпу дзеяння адрозніваюць *рэгенератары, рэкуператары* і змяшальныя Ц., дзе цеплата перадаецца пры змешванні цепланосьбітаў (гл. *Градзірня*).

ЦЕПЛААДДА́ЧА ў тэхніцы, цеплаабмен паміж рухомым асяроддзем *(цепланосьбітам)* і паверхняй яго раздзелу з інш. асяроддзем (цвёрдым целам, вадкасцю ці газам); асобны выпадак *цеплаперадачы*. Адбываецца за кошт *цеплаправоднасці*, канвектыўнага ці прамяністага *цеплаабмену*. Адрозніваюць Ц. пры свабодным і вымушаным руху цепланосьбіта, а таксама пры зменах яго агрэгатнага стану. Інтэнсіўнасць Ц. характарызуецца каэфіцыентам Ц. $\alpha = q/\Delta T$, дзе q — шчыльнасць *патоку энергіі* (шчыльнасць *цеплавога патоку*), ΔT — рознасць т-р (тэмпературны напор) паміж паверхняй раздзелу і цепланосьбітам.

ЦЕПЛАБА́ЧАННЕ, пераўтварэнне ўласнага ці адбітага *цеплавога выпрамянення* аб'ектаў у іх бачны відарыс. Прылада, з дапамогай якой атрымліваюць такое пераўтварэнне, наз. *цеплавізар.*

Сканіруючыя сістэмы Ц. з'явіліся ў 1930-я г. У якасці іх адчувальных элементаў выкарыстоўваліся *балометры* і *тэрмапары*, якія пераўтваралі цеплавое выпрамяненне ў эл. сігнал. У 1970-я г. створаны прылады, дзе цеплавы відарыс пераўтвараўся ў бачны пры праецыраванні яго на экран, пакрыты тонкім слоем рэчыва, якое пры награванні мяняла сваю таўшчыню (напр., за кошт выпарэння), афарбоўку (вадкія крышталі, тэрмаадчувальная фарба), інтэнсіўнасць свячэння (люмінафоры), празрыстасць (паўправадніковыя плёнкі), спантанную палярызацыю (піраэлектрыкі), магн. стан (тонкія магн. плёнкі) і інш. Ц. выкарыстоўваецца для вызначэння формы і месцазнаходжання аб'ектаў, размешчаных у аптычна непразрыстых асяроддзях ці ва ўмовах дрэннай бачнасці (гл. *Інтраскапія*) і інш.

ЦЕПЛАВА́Я ІЗАЛЯ́ЦЫЯ, ахова будынкаў, цеплавых прамысл. установак, халадзільных камер, трубаправодаў і інш. аб'ектаў ад непажаданага *цеплаабмену* з навакольным асяроддзем. Забяспечваецца абалонкамі, пакрыццямі, інш. адна- або мнагаслойнымі агароджамі з *цеплаізаляцыйных матэрыялаў*. Яны зніжаюць цеплавыя страты ў навакольнае асяроддзе (у збудаваннях, цеплаэнергет. устаноўках і да т.п.) або ахоўваюць апаратуру ад прытоку цеплаты звонку (у халадзільнай і крыягеннай тэхніцы). Цеплаахоўныя сродкі звычайна наз. *цеплаізаляцыяй.*

ЦЕПЛАВА́Я ПАРАТУРБІ́ННАЯ ЭЛЕКТРАСТА́НЦЫЯ, *цеплавая электрастанцыя*, на якой для прыводу электрычнага генератара выкарыстоўваецца *паравая турбіна*. Бываюць кандэнсацыйныя і *цеплаэлектрацэнтралі.*

Кандэнсацыйная Ц.п.э. выпрацоўвае толькі электраэнергію. Цеплата, атрыманая ад спальвання вугалю, прыроднага газу, мазуту і інш., выкарыстоўваецца для атрымання пары з патрэбнымі параметрамі (ціск 15—30 МПа пры 550—650 °С); цеплавая энергія пары спачатку пераўтвараецца ў мех. (у кандэнсацыйных турбінах), потым у электрычную (у электрагенератарах). Адпрацаваная ў турбіне пара кандэнсуецца, кандэнсат перапампоўваецца назад у паравы кацёл. Магутнасць станцый да 5 ГВт.

ЦЕПЛАВА́Я СЕ́ТКА, сістэма *трубаправодаў* цэнтралізаванага *цеплазабеспячэння*, па якіх цеплата пераносіцца цепланосьбітам (гарачай вадой, парай) ад крыніцы цяпла да спажыўцоў. Адрозніваюць Ц.с. магістральныя (радыяльныя і кальцавыя) і размеркавальныя; падземныя (у трубах, каналах, траншэях) і надземныя (на эстакадах або апорах).

На магістральных Ц.с. значнай працягласці ўстанаўліваюць *помпавыя станцыі*. Цепластраты зніжаюць *цеплаізаляцыяй*. Вонкавую паверхню труб захоўваюць ад карозіі воданепранікальнымі пакрыццямі; карозію ўнутр. паверхні труб і ўтварэнне накіпу прадухіляюць водападрыхтоўкай (ачысткай ад грубадысперсных і калоідных дамешкаў, солей магнію і кальцыю, аксідаў жалеза і медзі, раствораных газаў і інш.).

«ЦЕПЛАВА́Я СМЕРЦЬ» СУСВЕ́ТУ, гіпотэза, звязаная з экстрапаляцыяй дзеяння *другога закону тэрмадынамікі* на ўвесь Сусвет. Сфармулявана Р.*Клаўзіусам* (1865), які сцвярджаў, што «энергія свету пастаянная, а энтрапія імкнецца да максімуму», у выніку чаго Сусвет павінен перайсці ў стан поўнай *раўнавагі тэрмадынамічнай* (стан «цеплавой смерці»). Гіпотэза «Ц.с.»С. навукова не абгрунтаваная, таму што Сусвет не з'яўляецца звычайнай замкнутай сістэмай, для якой устаноўлены законы тэрмадынамікі. Пры апісанні эвалюцыі Сусвету неабходна ўлічваць пераменнае гравітацыйнае поле (гл. *Касмалогія*), наяўнасць якога прыводзіць да нестацыянарнасці: Сусвет павінен расшырацца ці сціскацца. Пры такіх умовах з прынцыпу нарастання энтрапіі не вынікае імкнення сістэмы да тэрмадынамічнай раўнавагі.

Літ.: Зельдович Я.Б., Новиков И.Д. Строение и эволюция Вселенной. М., 1975.

А.І.Болсун.

ЦЕПЛАВА́Я ТРУБА́, прыстасаванне, здольнае перадаваць вял. цеплавыя магутнасці пры малых перападах т-р. Уяўляе сабой герметызаваную канструкцыю (напр., трубу), часткова запоўненую вадкім *цепланосьбітам*. Дазваляе перадаваць *цеплавыя патокі*, у дзесяткі тысяч разоў большыя, чым стрыжні з самых цеплаправодных матэрыялаў (се-



Схема **цеплавой трубы**: 1 — зона награвання (выпарэння); 2 — зона ахаладжэння (кандэнсацыі); q — цеплавыя патокі. Чырвонымі стрэлкамі паказаны шлях пары, сінімі — вадкасці.

рабра, медзі ці алюмінію) такіх жа памераў.

У зоне награвання вадкі цепланосьбіт выпараецца з паглынаннем цеплаты, атрыманая пара кандэнсуецца ў зоне ахаладжэння з выдзяленнем цеплаты. Рух пары адбываецца за кошт рознасці ціскаў насычанай пары, якая вызначаецца рознасцю т-р зон награвання і ахаладжэння. Вадкасць вяртаецца ў зону награвання пад уздзеяннем знешніх сіл, напр., сілы цяжару ці за кошт рознасці капілярных ціскаў па капілярнай (кнотавай) структуры, размешчанай звычайна на сценах трубы. Выкарыстоўваецца ў электроніцы, энергетыцы, хім. тэхналогіі, касм., камп'ютэрнай і электратэхніцы і інш.

На Беларусі даследаванні па праблемах Ц.т., а таксама па распрацоўцы цеплаабменнікаў, цеплавых помпаў і інш. на іх аснове вядуцца ў Ін-це цепла- і масаабмену Нац. АН, Бел. Нац. тэхн. ун-це, Бел. дзярж. навук. канцэрне парашковай металургіі і інш.

ЦЕПЛАВА́Я ФУ́НКЦЫЯ, тое, што *энтальпія*.

ЦЕПЛАВА́Я ЭЛЕКТРАСТА́НЦЫЯ (ЦЭС), *электрастанцыя*, якая выпрацоўвае электрычную энергію ў выніку пераўтварэння цеплавой энергіі, што вылучаецца пры спальванні арган. паліва. Тэхналогія вытв-сці на Ц.э. ўключае пераўтварэнне хім. энергіі паліва (газу, мазуту, вугалю і інш.) у цеплавую энергію рабочага цела (у *котлаагрэгатах, паравых катлах*), потым у мех. энергію (у *цеплавых рухавіках*) і электрычную (у *электрычных генератарах*).

Ц.э. бываюць: на газападобным, вадкім, цвёрдым паліве і змешанага тыпу; з паравымі турбінамі (гл. *Цеплавая паратурбінная электрастанцыя*), газавымі турбінамі (гл. *Газатурбінная электрастанцыя*) і рухавікамі ўнутр. згарання (гл. *Дызельная электрастанцыя*); кандэнсацыйныя (выпрацоўваюць толькі электраэнергію, пры гэтым адпрацаваная ў турбіне пара кандэнсуецца і вяртаецца назад у кацёл) і цеплафікацыйныя (выпрацоўваюць эл. і цеплавую энергію, гл. *Цеплаэлектрацэнтраль*); базавыя (нясуць раўнамерную нагрузку на працягу года) і пікавыя (працуюць па рэзказменным графіку нагрузкі). Да ЦЭС адносяць *атамныя электрастанцыі, геатэрмальныя электрастанцыі, сонечныя электрастанцыі*, МГД-электрастанцыі (з *магнітагідрадынамічнымі генератарамі*). Першыя ЦЭС з'явіліся ў 1882 у Нью-Йорку і 1883 у Пецярбургу. Найбольшыя ЦЭС на Беларусі — *Лукомская ДРЭС, Бярозаўская ДРЭС, Светлагорская ЦЭЦ*, Мінская ЦЭЦ-4 (1030 МВт; гл. *Беларуская энергетычная сістэма, Мінскія ЦЭЦ*).

Г.І.Хуцкі, У.М.Сацута.

ЦЕПЛАВІ́ЗАР, прылада для атрымання *відарыса аптычнага* аб'ектаў (ці іх цеплавых палёў) па іх цеплавым выпрамяненні (гл. *Цеплабачанне*). Мае оптыка-мех. ці электронную сістэму сканіравання, прыёмнік (дэтэктар) цеплавога выпрамянення, відэаўзмацняльнік і прыладу для пераўтварэння эл. сігналаў у бачны відарыс (напр., кінескоп). Выкарыстоўваецца для вызначэння месцазнаходжання аб'ектаў, размешчаных у аптычна непразрыстых асяроддзях ці ва ўмовах дрэннай бачнасці, вывучэння ўнутр. будовы цел, непразрыстых у бачным святле, для дыягностыкі ў медыцыне, у навігацыі, ваен. справе, геал. разведцы, дэфектаскапіі, пры вывучэнні цеплавых працэсаў і інш.

ЦЕПЛАВО́Е ВЫПРАМЯНЕ́ННЕ, тэмпературнае выпрамяненне, электрамагнітнае выпрамяненне, якое вылучае рэчыва, што знаходзіцца пры пэўнай т-ры, за кошт уласнай унутр. энергіі; адна з форм *цеплаперадачы*.

Узнікае ва ўмовах дэталёвай раўнавагі ў рэчыве (гл. *Дэталёвай раўнавагі прынцып*), мае неперарыўны спектр, максімум якога залежыць ад т-ры рэчыва. Пры нізкіх т-рах б.ч. энергіі Ц.в. прыпадае на радыёхвалі і інфрачырвоныя прамяні, пры высокіх — на бачнае і ультрафіялетавае выпрамяненне. Ц.в., якое знаходзіцца ў тэрмадынамічнай раўнавазе з рэчывам, наз. *раўнаважным выпрамяненнем* і характарызуецца законамі выпрамянення *абсалютна чорнага цела* (гл. *Планка закон выпрамянення, Стэфана—Больцмана закон выпрамянення*). Для Ц.в. нячорных цел выконваецца *Кірхгофа закон выпрамянення*. Ц.в. адыгрывае вызначальную ролю ў працэсах пераносу энергіі ў газах, плазме, атмасферах планет і зорак.

Літ.: Планк М. Теория теплового излучения: Пер. с нем. Л.; М., 1935; Ельяшевич М.А. Атомная и молекулярная спектроскопия. М., 1962.

А.І.Болсун.

ЦЕПЛАВО́Е ЗАБРУ́ДЖВАННЕ, тое, што *тэрмічнае забруджванне*.

ЦЕПЛАВО́Е РАСШЫРЭ́ННЕ, змена аб'ёму цел пры награванні. Колькасна характарызуецца ізабарным (пры пастаянным ціску p) каэф. аб'ёмнага расшырэння: $\gamma = (1/V)(dV/dT)_p$, дзе V — аб'ём цела, T — яго абс. т-ра. Для большасці цел $\gamma>0$ (выключэнне — вада, у якой пры т-ры ад 0 °С да 4 °С $\gamma < 0$). Ц.р. найбольшае ў газаў (для *ідэальнага газу* $\gamma = 1/273$); у вадкасцей яно слабейшае. Для цвёрдых цел уводзяць таксама каэф. лінейнага расшырэння α (адносіны змены даўжыні цела ўздоўж вызначанага напрамку пры ізабарным награванні да прырашчэння т-ры); $\alpha = (1/l)(dl/dT)_p$, дзе l — даўжыня цела. Для ізатропных цел $\gamma = 3\alpha$. Метады вымярэння Ц.р. вывучае *дылатаметрыя*.

ЦЕПЛАВО́З, аўтаномны *лакаматыў*, першасным рухавіком якога з'яўляецца *цеплавы рухавік* (звычайна *дызель*). Рухавік Ц. пераўтварае энергію вадкага паліва ў мех. энергію, якая праз *сілавую перадачу* надае вярчальны рух колавым парам.

Бываюць 1-, 2-, 3- і 4-секцыйныя; магістральныя (грузавыя, пасажырскія) і манеўровыя. Асн. часткі Ц. (акрамя рухавіка): цягавая перадача (пераважна электрычная, а таксама мех., гідраўл., электрагідраўл., газавая), экіпажная частка (кузаў, аўтасчэпка, цялежкі з колавымі парамі і рысорнай падвескай), дапаможнае абсталяванне (сістэмы ахаладжэння, змазкі, паліпадачы, пажаратушэння, вентыляцыі, тармажэння і інш.). У машынным аддзяленні — дызель, гал. генератар (пры эл. перадачы) або гідраўл. апараты (пры гідраўл. перадачы), акумулятарныя батарэі і інш. Дызельнае паліва, масла, вада і пясок захоўваюцца ў спец. ёмістасцях. У параўнанні з *паравозам* Ц. мае большы ккдз (0,29—0,33), магчымасць павялічваць (у 5—8 разоў) адлегласць паміж пунктамі запраўкі палівам. Магутнасць магістральных Ц. да 3000 кВт і больш, скорасць да 160 км/гадз і больш. Першы магістральны Ц. створаны ў Расіі ў 1921—24 па праекце вучонага і канструктара Я.М.Гакеля (1874—1945), першы серыйны Ц. выпушчаны ў 1923. Папярэднікамі Ц. былі *аўтадрызіны* і *матавозы*. У сярэдзіне 20 ст. створаны Ц. з газатурбіннай установкай — *газатурбавозы*.

І.І.Леановіч.

ЦЕПЛАВОЗАБУДАВА́ННЕ, галіна машынабудавання, якая выпускае *цеплавозы*. Гл. ў арт. *Чыгуначнае машынабудаванне*.

ЦЕПЛАВЫ́ БАЛА́НС зямной паверхні, сума патокаў цяпла, якія прыходзяць на зямную паверхню і адбіваюцца ад яе. Выражаецца ўраўненнем: $B + LE + P + A + F = 0$, дзе B — радыяцыйны баланс зямной паверхні, LE — затраты цяпла на выпарэнне



Цеплавоз: 1 — пульт кіравання ў кабіне машыніста; 2 — камеры электраабсталявання; 3 — матор-вентылятары электрадынамічнага тормаза; 4 — сілавая выпрамляльная ўстаноўка; 5 — дызель; 6 — секцыя ахаладжэння вады; 7 — кампрэсар; 8 — паліўны бак; 9 — акумулятарная батарэя; 10 — цягавы генератар; 11 — цягавы электрарухавік; 12 — пуцеачышчальнік.

(L — удзельная цеплата выпарэння, E — колькасць вады, што выпарылася), P — паступленне цяпла ў атмасферу, ці вяртанне яго да зямной паверхні шляхам турбулентнага цеплаабмену, A — цеплаабмен паміж зямной паверхняй і ніжнімі слаямі глебы або вады, F — расход энергіі на фотасінтэз. Сэнс ураўнення ў тым, што радыяцыйны баланс на зямной паверхні ўраўнаважваецца нерадыяцыйнай перадачай цяпла. Суадносіны паміж кампанентамі балансу мяняюцца ў часе і прасторы ў залежнасці ад уласцівасцей паверхні, кліматычных умоў, перыяду года і сутак. Цеплавы баланс вызначае занальнасць клімату і прыродных умоў, першасную біял. прадукцыйнасць экасістэм.

П.А.Каўрыга.

ЦЕПЛАВЫ́ ПАТО́К, *колькасць цеплаты*, што праходзіць праз адвольную ізатэрмічную паверхню за адзінку часу. Ц.п., аднесены да адзінкі ізатэрмічнай паверхні, наз. шчыльнасцю Ц.п., удзельным Ц.п. ці цеплавой нагрузкай. Адзінка Ц.п. ў СІ — *ват*.

ЦЕПЛАВЫ́ РУХАВІ́К, найбольш пашыраны першасны *рухавік*, які пераўтварае цеплавую энергію ў механічную. Выкарыстоўвае прыродныя энергет. рэсурсы ў выглядзе хім. або ядз. паліва. Падзяляюцца на поршневыя (гл. *Поршневая машына*), ротарныя (гл. *Ратарная машына*) і *рэактыўныя рухавікі*.

Паводле спосабу падводу цеплаты для нагрэву рабочага цела Ц.р. падзяляюцца на *рухавікі ўнутранага згарання* і знешняга згарання, у якіх рабочае цела атрымліваецца або награецца па-за самім рухавіком у спец. прыстасаваннях (рухавікі Стырлінга, *паравыя машыны, ядзерныя сілавыя ўстаноўкі*). Магчымы і камбінацыі розных тыпаў Ц.р. (напр., *турбарэактыўны рухавік*). У аснове работы Ц.р. ляжыць замкнёны або ўмоўна замкнёны *цыкл тэрмадынамічны* (прамы *кругавы працэс*). У рухавіках Стырлінга (распрацаваны ў 1816 англ. вучоным Р.Стырлінгам) рабочае цела (гелій або вадарод) пастаянна знаходзіцца ў замкнёнай прасторы і зменьвае свой аб'ём пры награванні і ахаладжэнні. Цеплата ўтвараецца па-за рабочымі поласцямі, напр., пры згаранні хім. паліва. Гэтыя Ц.р. выкарыстоўваюць на аўтамабілях і суднах. Эфектыўны ккдз Ц.р. (адносіны мех. работы на яго выходным вале да падведзенай цеплавой энергіі) — да 60%. На Беларусі дызельныя Ц.р. выпускае *Мінскі маторны завод*.

ЦЕПЛАВЫ́ РЭЖЫ́М ГЛЕ́БЫ, змены цеплавога стану глебы ў часе. Мае сутачную, гадавую, шматгадовую цыклічнасць. Асн. крыніца цяпла ў глебе — сонечная радыяцыя. Вызначаецца сукупнасцю з'яў цеплаабмену ў сістэме: прыземны слой паветра—расліна—глеба—горная парода; працэсамі цеплапераносу і цеплаакумуляцыі ў самой глебе; яе цеплавымі характарыстыкамі (*цеплаправоднасць*, тэмператураправоднасць, *цеплаёмістасць*), якія залежаць ад тыпу, вільготнасці, шчыльнасці, т-ры, мех., хім. і мінер. складу глебы і мяняюцца пад уплывам агратэхн., меліярац. уздзеянняў і клімат. фактараў. Для рэгулявання Ц.р.г. выкарыстоўваюць агульнамеліярац. прыёмы (асушэнне, арашэнне, снегазатрыманне, мульчыраванне) і спец. мерапрыемствы (грэбеняванне, прыкочванне, зацяненне, пакрыццё плёнкамі, штучнае абагараванне).

ЦЕПЛАВЫ́ ЎДАР, востры паталаг. стан чалавека і жывёл, абумоўлены парушэннем *тэрмарэгуляцыі* арганізма. Бывае пры працяглым уздзеянні на арганізм высокай т-ры навакольнага асяроддзя або непасрэдным уздзеянні сонечных прамянёў (гл. *Сонечны ўдар*). У чалавека праяўляецца галаўным болем, ірвотай, стратай прытомнасці і інш.

ЦЕПЛАВЫ́ ЭФЕ́КТ РЭА́КЦЫІ ў хіміі, колькасць цеплаты, выдзеленай (паглынутай) у дадзенай *рэакцыі хімічнай*. Вымяраецца непасрэдна пры правядзенні рэакцыі ў *каларыметры*, а таксама разлічваецца аналітычна. У залежнасці ад знака Ц.э.р. адрозніваюць *экзатэрмічныя рэакцыі* і *эндатэрмічныя рэакцыі*.

Абумоўлены рознасцю паміж энергіяй, неабходнай для разрыву хім. сувязей зыходных рэчываў, і энергіяй, вылучанай пры ўтварэнні новых сувязей у прадуктах гэтай рэакцыі. Ц.э.р. ўтварэння рэчыва вызначаюць таксама па цеплавым эфекце інш. рэакцыі, у якой удзельнічае дадзенае рэчыва (гл. *Геса закон*). Ц.э.р. карыстаюцца ў тэарэт. хіміі пры разліках выхаду прадуктаў рэакцыі, удзельнай цягі паліва рэактыўнага рухавіка і інш. прыкладных задач (гл. *Тэрмадынаміка хімічная*).

ЦЕПЛАВЫ́Я НЕЙТРО́НЫ, нейтроны з энергіяй умоўна ў межах ад 0,5 эВ да 5 МэВ. Атрымліваюцца пры запавольванні нейтронаў да цеплавой раўнавагі з атамамі асяроддзя (адсюль назва). Выклікаюць *ланцуговую ядзерную рэакцыю* дзялення плутонію і некаторых ізатопаў урану. Даўжыня *хвалі дэ Бройля* Ц.н. параўнальная з міжатамнымі адлегласцямі цвёрдага цела. Выкарыстоўваюцца для даследаванняў руху атамаў і малекул у цвёрдых целах і вадкасцях.

ЦЕПЛАВЫ́Я ПАЯСЫ́, тэрмічныя паясы, шыротныя паясы Зямлі з пэўнымі ўмовамі т-ры паветра. Вылучаюць 7 Ц.п.: гарачы пояс у трапічных шыротах (паміж гадавымі ізатэрмамі 20 °С, асобныя вобласці маюць т-ры больш за 30 °С); умераныя паясы Паўн. і Паўд. паўшар'яў (паміж гадавой ізатэрмай 20 °С і ізатэрмай самага цёплага месяца 10 °С), халодныя паясы абодвух паўшар'яў (паміж ізатэрмамі самага цёплага месяца 10 °С і 0 °С); 2 паясы вечнага марозу (з ізатэрмамі ўсіх месяцаў ніжэй за 0 °С).

ЦЕПЛАГЕНЕРА́ТАР, агрэгат, прылада, прыстасаванне, у якіх у выніку гарэння паліва, іншых хім. рэакцый або пераўтварэння эл. энергіі вылучаецца цеплата. Па сутнасці Ц. з'яўляюцца прамысл. і быт. *печы*, *награвальныя прылады*, цеплатэхн. *парагенератары*, *паравыя катлы*, адпаведныя тыпы *рэактараў хімічных* і *ядзерных рэактараў*.

ЦЕПЛАЁМІСТАСЦЬ, фізічная велічыня, роўная адносінам *колькасці цеплаты*, паглынутай целам пры бясконца малой змене яго т-ры, да лікавага значэння гэтай змены. Эксперыментальна вымяраецца метадамі *каларыметры*. Тэарэт. вылічэнні залежнасці Ц. ад т-ры ў большасці выпадкаў патрабуюць выкарыстання метадаў стат. фізікі (пры нізкіх т-рах — *квантавай статыстыкі*). Залежыць ад пач. і канечнага станаў цела, а таксама ад спосабу пераходу паміж імі, паводле якога адрозніваюць Ц. пры пастаянным ціску і пры пастаянным аб'ёме. Ц., аднесеная да масы цела, наз. ўдзельнай, да колькасці рэчыва — мольнай (малярнай). Адзінка Ц. ў СІ джоўль на кельвін, удзельнай і мольнай — адпаведна джоўль на кілаграм-кельвін і джоўль на моль-кельвін.



Да арт. **Цеплазабеспячэнне**: а — схема закрытай двухтрубнай сістэмы цэнтралізаванага цеплазабеспячэння будынка: 1 — крыніца цеплазабеспячэння; 2, 3 — воданагравальнікі; 4 — сістэма гарачага водазабеспячэння; 5 — бак-акумулятар; 6 — сістэма ацяплення; 7 — элеватар; 8 — каларыфер; б — схема адкрытай двухтрубнай сістэмы цэнтралізаванага цеплазабеспячэння: 1 — крыніца цеплазабеспячэння; 2 — адваротны клапан; 3 — змяшальнік гарачай вады; 4 — сістэма гарачага водазабеспячэння; 5 — сістэма ацяплення; 6 — элеватар; 7 — каларыфер.

ЦЕПЛАЗАБЕСПЯЧЭ́ННЕ, падача *цепланосьбіта* ў сістэмы *ацяплення*, гарачага *водазабеспячэння і вентыляцыі* жылых, грамадскіх, прамысл. будынкаў і тэхнал. спажыўцам.

Адрозніваюць мясц. і цэнтралізаванае Ц. Цепланосьбіт — вада (т-ра звычайна да 150 °С) ці пара (ціск 0,5—4,0 МПа). Пры мясц. Ц. крыніцы цяпла — печы, вадагрэйныя катлы, сонечныя ўстаноўкі і інш., што месцяцца паблізу спажыўца. Цэнтралізаваныя сістэмы абслугоўваюць спажыўцоў у прамысл. і жылых раёнах (далёкасць транспартавання цепланосьбіта да некалькіх дзесяткаў км). Складаюцца з адной або некалькіх крыніц цяпла (*цеплаэлектрацэнтралей*, кацельных установак вял. магутнасці, устройстваў для утылізацыі цеплавых адходаў прадпрыемстваў і інш.), *цеплавой сеткі* і цепласпажывальных установак. У залежнасці ад схемы далучэння ўстановак гарачага водазабеспячэння адрозніваюць закрытыя і адкрытыя сістэмы Ц. У закрытых вада паступае да спажыўца ад цеплавых сетак праз воданагравальнікі цеплавых пунктаў і вяртаецца з сістэмы да крыніцы Ц. У адкрытых — непасрэдны адвод вады з цеплавой сеткі да спажыўца. Вада як цепланосьбіт у параўнанні з парай мае шэраг пераваг: магчымасць цэнтр. якаснага рэгулявання аддачы цяпла, падтрымання неабходнай па гігіенічных умовах т-ры награвальных прылад, прастата абслугоўвання і бясшумнасць у рабоце. Расход цяпла ў сістэмах Ц. рэгулююць змяненнем т-ры і колькасці цепланосьбіта, перыяд. спыненнем яго паступлення і камбінаванымі метадамі. *В.Р.Баштавой.*

ЦЕПЛАЗМЯШЧА́ЛЬНАСЦЬ, тое, што *энтальпія*.

ЦЕПЛАІЗАЛЯЦЫ́ЙНЫЯ МАТЭРЫЯ́ЛЫ, матэрыялы, якія маюць нізкую цеплаправоднасць і выкарыстоўваюцца для *цеплавой ізаляцыі*. Бываюць арганічныя, неарганічныя і змешанага тыпу.

А р г а н і ч н ы я Ц.м.: *драўнянавалакністыя пліты, драўнянастружкавыя пліты*, тарфяныя пліты, буд. *лямец*, пена- і парапласты (гл. *Газанапоўненыя пластыкі*) і інш.; н е а р г а н і ч н ы я: мінер. і шкляная *вата*, успучаныя *вермікуліт* і *перліт*, а таксама *вермікулітабетон, перлітабетон*, вырабы на аснове *азбесту, ячэісты бетон*, легкаважныя *вогнетрывалыя матэрыялы, пенабетон, пенашкло*, газабетон і інш.; з м е ш а н а г а т ы п у: *арбаліт, фібраліт, валакніты* і інш., якія атрымліваюць з сумесі мінер. вяжучага і арган. запаўняльніка. Асн. характарыстыкі Ц.м.: каэф. цеплаправоднасці (звычайна 0,02—0,2 Вт/м·К), порыстасць (60% і больш), невял. сярэдняя шчыльнасць (да 350 кг/м³). Большасць арган. Ц.м. мае нізкую вогнетрываласць, таму іх выкарыстоўваюць пры т-рах да 150 °С. Для ізаляцыі абсталявання і ўстановак, што працуюць пры т-рах вышэй за 1000 °С, выкарыстоўваюць вогнетрывалыя і валакністыя матэрыялы на аснове мінер. вяжучых. *Я.М.Кавалёў.*

ЦЕПЛАІЗАЛЯ́ЦЫЯ, пашыраная назва цеплаахоўных сродкаў (абалонак, пакрыццяў і інш. з *цеплаізаляцыйных матэрыялаў*), якія выкарыстоўваюцца для *цеплавой ізаляцыі* прамысл. абсталявання, трубаправодаў і інш.

ЦЕ́ПЛА- І МА́САА́БМЕН, неабарачальны працэс пераносу цеплаты і рэчыва ў асяроддзі, абумоўлены неаднароднасцямі палёў т-ры, канцэнтрацыяй рэчыва і інш.; кірунак навукі, які вывучае ўзаемазвязаныя працэсы пераносу цеплавой энергіі і рэчыва.

Да працэсаў Ц.- і м. адносяць *дыфузію, тэрмадыфузію*, усе віды *цеплаабмену* і інш. і іх камбінацыі (перакрыжаваныя працэсы), якія адбываюцца ў цвёрдых (у т.л. сыпкіх і сітаватых), вадкіх і газападобных асяроддзях, а таксама ў *плазме* і ў *вакууме*, дзе магчымы таксама фазавыя пераходы, хім., ядз. і інш. рэакцыі. Працэсы Ц.- і м. даследуюцца фенаменалагічнымі і статыстычнымі метадамі.

На Беларусі сістэм. даследаванні па праблемах Ц.- і м. пачаліся ў 1947 і вядуцца ў Ін-це цепла- і масаабмену, Аб'яднаным ін-це энергет. і ядз. даследаванняў — «Сосны» Нац. АН, Бел. Нац. тэхн. ун-це, БДУ і інш.

ЦЕПЛАКРО́ЎНЫЯ ЖЫВЁЛЫ, гл. *Гамаятэрмныя жывёлы*.

ЦЕПЛАЛАКА́ТАР, разнавіднасць аптычнага *лакатара*. Працуе ў дыяпазоне эл.-магн. хваль інфрачырвонага (цеплавога) выпрамянення.

ЦЕПЛАЛЯЧЭ́ННЕ, т э р м а т э р а п і я, выкарыстанне цеплавых працэдур з лячэбнай мэтай. Адрозніваюць Ц. мясц. (сагравальныя кампрэсы, грэлкі і інш.) і агульнае (ванны, электракоўдры і інш.). У якасці цепланосьбітаў пашыраны *гразі лячэбныя, парафін, азакерыт*, гліна, пясок, спец. мед. пластмасы, якія разаграваюць эл. токам. Т-ра цепланосьбітаў пры Ц. — 40—60 °С і вышэй. Ц. ўзмацняе крова- і лімфазварот, потааддзяленне, стымулюе абменныя працэсы, аказвае болесуцішальнае, процізапаленчае, рассысальнае дзеянне, паскарае працэсы рэгенерацыі. Паказана пры хранічных захворваннях пазваночніка, суставаў, мышцаў, нерв. і мочапалавой сістэм, органаў дыхання і інш. Для лячэння анкалагічных хворых выкарыстоўваюць асобы від Ц. — агульнае награванне з ахаладжэннем галавы. *І.М.Семяненя.*

ЦЕПЛАНО́СЬБІТ, рэчыва, што пераносіць цеплату ад больш нагрэтага цела да менш нагрэтага. Як Ц. шырока выкарыстоўваюць дымавыя і інш. нагрэтыя газы, ваду, вадзяную пару, вадкія металы, *хладоны* і інш. Выкарыстоўваецца для награвання, ахаладжэння, сушкі, тэрмічнай апрацоўкі ў сістэмах цеплазабеспячэння, ацяплення, вентыляцыі, а таксама ў цеплавых прыстасаваннях тэхнал. прызначэння.

ЦЕПЛАПЕЛЕНГА́ТАР, оптыка-электронная *навігацыйная прылада* для выяўлення і вызначэння вуглавых каардынат аб'ектаў (цэлей) пры дапамозе іх інфрачырвонага (цеплавога) выпрамянення.

Дазваляе выяўляць і з высокай дакладнасцю селектыўна суправаджаць цэлі на вял. адлегласцях. Выкарыстоўваецца ў марской і паветр. навігацыі, ваен. справе і інш.

ЦЕПЛАПЕРАДА́ЧА, цеплаабмен паміж двума *цепланосьбітамі* праз паверхню раздзелу паміж імі, у т.л. праз цвёрдую сценку. Складаецца з *цеплааддачы* ад больш нагрэтага цепланосьбіта да сценкі, *цеплаправоднасці* ў сценцы і цеплааддачы ад сценкі да больш халоднага цепланосьбіта. Інтэнсіўнасць Ц. характарызуецца каэфіцыентам Ц. $\alpha = q/\Delta T$, дзе q — шчыльнасць патоку энергіі (шчыльнасць *цеплавога патоку*), ΔT — рознасць т-р паміж цепланосьбітамі. У большасці практычных выпадкаў каэфіцыент Ц. вызначаецца эксперыментальна, атрыманыя вынікі апрацоўваюцца метадамі *падобнасці тэорыі*.

ЦЕПЛАПРАВО́ДНАСЦІ ЎРАЎНЕ́ННЕ, дыферэнцыяльнае ўраўненне ў частковых вытворных, якое апісвае працэс распаўсюджвання цеплаты ў асяроддзі; асн. ўраўненне матэм. тэорыі *цеплаправоднасці*. Выражае цеплавы баланс для элементарнага аб'ёму асяроддзя з улікам паступлення цеплаты ад крыніц і страт цеплаты праз паверхню гэтага аб'ёму за кошт цеплаправоднасці.

Для ізатропнага аднароднага асяроддзя мае выгляд: $\frac{\partial T}{\partial t} = a^2 \Delta T + f$, дзе T — шуканая т-ра, якая вылічваецца па Ц.ў., t — час, $a^2 = \lambda/(\rho c_v)$ — каэфіцыент тэмператураправоднасці: λ — каэфіцыент цеплаправоднасці, ρ — шчыльнасць рэчыва, c_v — цеплаёмістасць асяроддзя пры пастаянным аб'ёме, $f = F/(\rho c_v)$, F — зададзеная шчыльнасці крыніц цеплаты. У стацыянарным стане (T не мяняецца ў часе) Ц.ў. пераходзіць у *Пуасона ўраўненне*, а пры адсутнасці крыніц цеплаты — у *Лапласа ўраўненне*.

ЦЕПЛАПРАВО́ДНАСЦЬ, адзін з відаў пераносу *цеплаты* ад больш нагрэтых участкаў цела да менш нагрэтых (гл. *Пераносу з'явы*); асобны выпадак *цеплаабмену*. Ажыццяўляецца ў выніку перадачы энергіі ад часціц (атамаў, малекул, электронаў) з большай энергіяй часціцам з меншай энергіяй.

Эксперыментальна ўстаноўлена, што для ізатропных асяроддзяў шчыльнасць *цеплавога патоку* q прапарцыянальная градыенту т-ры (закон Фур'е): $q = -\lambda \operatorname{grad} T$, дзе λ — каэфіцыент Ц., $\operatorname{grad} T$ — градыент т-ры. Каэфіцыент Ц. залежыць ад агрэгатнага стану рэчыва, яго атамна-малекулярнай будовы, т-ры, ціску і інш. Парушэнні закона Фур'е выяўляюцца пры вял. значэннях градыента т-ры (напр., ва ўдарных хвалях), пры нізкіх тэмпературах, у разрэджаных газах (вакууме).

ЦЕПЛАРО́Д, паводле пашыраных у 18 — пач. 19 ст. поглядаў, бязважкая матэрыя, што прысутнічае ў кожным целе і з'яўляецца прычынай цеплавых з'яў. Памылковасць канцэпцыі Ц. даказана ў сярэдзіне 19 ст. ўсёй сукупнасцю даных *малекулярнай фізікі*.

ЦЕПЛАТА́, 1) спосаб (форма) змены ўнутранай энергіі цела (сістэмы) без выканання работы; тое, што *цеплаабмен*. 2) Пры разглядзе асобных цепла-

вых працэсаў і з'яў — тое, што *колькасць цеплаты*. Напр., Ц. выпарэння, Ц. плаўлення.

ЦЕПЛАТА́ ВЫПАРО́ЎНЯ, цеплата параўтварэння, *колькасць цеплаты*, якую неабходна перадаць рэчыву ў раўнаважным ізабарна-ізатэрмічным працэсе (пры пастаянных ціску і т-ры) для поўнага ператварэння яго з вадкага стану ў газападобны; адзін з відаў *цеплаты фазавага пераходу*. Такая ж колькасць цеплаты вылучаецца пры *кандэнсацыі* пары ў вадкасць. Адрозніваюць удзельную і мольную (малярную) Ц.в., аднесеныя адпаведна да адзінкі масы і адзінкі колькасці рэчыва (1 моль); адзінкі Ц.в. ў СІ — джоўль на кілаграм і джоўль на моль адпаведна.

ЦЕПЛАТА́ ЗГАРА́ННЯ паліва, каларыйнасць, цеплатворная здольнасць, *колькасць цеплаты*, якая вылучаецца пры поўным згаранні паліва. Залежыць ад хім. саставу паліва. Адрозніваюць Ц.з. нiжэйшую — без уліку цеплаты, якая затрачваецца на выпарэнне вады, што ўтрымліваецца ў паліве ці ўтвараецца пры яго згаранні, і вышэйшую — з улікам гэтай цеплаты. Ц.з., аднесеная да адзінкі масы (для цвёрдага паліва) ці аб'ёму (для газу) паліва, наз. ўдзельнай Ц.з., вымяраецца метадамі *каларыметрыі*. Адзінка Ц.з. ў СІ — *джоўль*, удзельнай Ц.з. — джоўль на кілаграм ці джоўль на кубічны метр.

ЦЕПЛАТА́ ПЛАЎЛЕ́ННЯ, *колькасць цеплаты*, якую неабходна перадаць рэчыву ў раўнаважным ізабарна-ізатэрмічным працэсе (пры пастаянных ціску і т-ры) для поўнага ператварэння яго з цвёрдага крышт. стану ў вадкі; адзін з відаў *цеплаты фазавага пераходу*. Такая ж колькасць цеплаты вылучаецца пры *крышталізацыі* рэчыва з вадкай фазы. Адрозніваюць удзельную і мольную (малярную) Ц.п., аднесеныя адпаведна да адзінкі масы і адзінкі колькасці рэчыва (1 моль); адзінкі Ц.п. ў СІ — адпаведна джоўль на кілаграм і джоўль на моль.

ЦЕПЛАТА́ ФА́ЗАВАГА ПЕРАХО́ДУ, *колькасць цеплаты*, якую неабходна перадаць рэчыву (ці адвесці ад яго) пры раўнаважным ізабарна-ізатэрмічным пераходзе рэчыва з адной фазы ў другую (*фазавым пераходзе* I роду — *кіпенні, плаўленні, крышталізацыі*, паліморфным ператварэнні і інш.). Існаванне Ц.ф.п. абумоўлена рознымі значэннямі *энергій сувязі* рэчыва ў адпаведных фазах. Для фазавага пераходу II роду Ц.ф.п. роўная нулю. Раўнаважны фазавы пераход пры дадзеным ціску адбываецца пры пастаяннай т-ры — т-ры фазавага пераходу. Ц.ф.п. роўная здабытку т-ры фазавага пераходу на рознасць энтрапій у дзвюх фазах, паміж якімі адбываецца пераход. Адрозніваюць удзельную і мольную (малярную) Ц.ф.п., аднесеныя адпаведна да адзінкі масы і адзінкі колькасці рэчыва (1 моль). Гл. таксама *Цеплата выпарэння, Цеплата плаўлення*.

ЦЕПЛАТЭ́ХНІКА, галіна *тэхнікі* па вытв-сці і выкарыстанні цеплавой энергіі ў тэхнал. працэсах, на транспарце, у побыце; навука, якая вывучае асн. заканамернасці пераўтварэння хім. энергіі паліва ў цеплату, мех. і эл. энергію. Тэарэт. асновы Ц. — *тэрмадынаміка*, тэорыя *цеплаперадачы*, тэорыя цеплаабменных апаратаў, турбін і інш.

Асн. крыніца атрымання цеплаты — *паліва* (цвёрдае — вугаль, торф, сланцы; вадкае — нафта; газ — прыродны і доменны). У працэсе *гарэння* ўдзельнічаюць паліва і акісляльнік. Прадукты згарання маюць высокую т-ру і з'яўляюцца энерганосьбітам, цяпло якога ідзе на розныя мэты. Важная крыніца цяпла — *ядзерная энергія*. Выкарыстоўваюць таксама сонечную энергію (гл. *Геліятэхніка, Гелія-ўстаноўка*) і глыбіннае цяпло Зямлі (гл. *Геатэрмальная электрастанцыя*). Адрозніваюць 2 асн. кірункі Ц.: цеплавыкарыстанне (спажыванне цяпла ў прамысл. печах, цеплаабменных апаратах, тэхнал. працэсах, побыце, гл. *Цеплазабеспячэнне, Ацяпленне*) і *цеплаэнергетыка* (выкарыстоўвае цяпло для атрымання інш. відаў энергіі, гл. *Энергетыка*). На Беларусі даследаванні ў галіне Ц. праводзяцца ў *Інстытуце цепла- і масаабмену імя А.В.Лыкава*, Бел. нац. тэхн. ун-це.

Літ.: Телегин А.С., Швыдкий В.С., Ярошенко Ю.Г. Термодинамика и тепломассоперенос. М., 1980; Теплотехника. 2 изд. М., 2000. *В.Р.Баштавой.*

ЦЕПЛАТЭХНІ́ЧНЫЯ ПРЫЛА́ДЫ вымяральныя, прылады, якімі вымяраюць фіз. велічыні ў працэсе вытв-сці і выкарыстання цяпла. Пашыраны прылады для вымярэння т-ры, ціску, разрэджання, цеплазмяшчэння, цеплаправоднасці, саставу газаў пры гарэнні паліва, расходу вадкасцей, газу і пары.

Ц.п. разнастайныя сваёй будовай і прынцыпам дзеяння. Т-ру вымяраюць *тэрмометрамі*, піраметрамі, *тэрмапарамі*; ціск — *манометрамі*, разрэджанні — *вакуумметрамі*; колькасць і расход рабочых рэчываў у цеплавых установах — *расхадамерамі*; колькасны састаў дымавых газаў пры рабоце топак паравых катлоў і прамысл. печаў — *газааналізатарамі*; колькасць цеплаты — *каларыметрамі*.

ЦЕПЛАФІКАЦЫ́ЙНАЯ ТУРБІ́НА, *паравая турбіна* для адначасовага атрымання электраэнергіі ад генератара, які прыводзіцца ёю ў дзеянне, і цеплавой энергіі ў выглядзе пары, што адпрацавала ў турбіне і ідзе на патрэбы *цеплафікацыі*.

Ёсць Ц.т. з процiціскам, у якіх уся адпрацаваная пара выкарыстоўваецца для тэхнал. мэт (варкі, сушкі, ацяплення). Звычайна працуюць паралельна з кандэнсацыйнымі турбінамі, якія пакрываюць дэфіцыт электраэнергіі ў эл. сетцы. У Ц.т. з рэгулюемым адборам пары частка пары адводзіцца з 1 або 2 прамежкавых ступеней, астатняя ідзе ў кандэнсатар. Ціск пары, якая адбіраецца, падтрымліваецца ў зададзеных межах сістэмай рэгулявання.

ЦЕПЛАФІКАЦЫ́ЙНАЯ ЭЛЕКТРАСТА́НЦЫЯ, *цеплавая электрастанцыя*, якая ажыццяўляе вытворчасць адначасова электрычнай і цеплавой энергіі. Гл. *Цеплаэлектрацэнтраль*.

ЦЕПЛАФІКАЦЫ́ЙНЫ КАЦЁЛ, *котла-агрэгат*, які адначасова забяспечвае пар ай *цеплафікацыйныя турбіны* і вырабляе пару або гарачую ваду на тэхнал., ацяпляльныя і інш. патрэбы. Звычайна Ц.к. барабанныя, радзей прамацечныя.

ЦЕПЛАФІКА́ЦЫЯ, цэнтралізаванае *цеплазабеспячэнне*, заснаванае на камбінаванай выпрацоўцы цяпла і эл. энергіі на *цеплаэлектрацэнтралях* (ЦЭЦ). Пры Ц. эфектыўнасць выкарыстання паліва значна вышэйшая, чым пры раздзельнай выпрацоўцы цяпла (у кацельных установах) і электраэнергіі (на кандэнсацыйных электрастанцыях).

У склад цеплафікацыйных сістэм уваходзяць крыніцы цеплазабеспячэння (ЦЭЦ, вадагрэйныя кацельні і інш.), *цеплавыя сеткі*, устройствы для спажывання цяпла (сістэм *ацяплення*, гарачага *водазабеспячэння*, тэхналагічныя). У СССР Ц. пачалася ў 1924 (Ленінград), на Беларусі — у 1936, калі пабудавана Мінская ЦЭЦ-2. Значнае развіццё атрымала з пач. 1950-х г.: пабудаваны Мінская ЦЭЦ-3, Віцебская, Пінская, Баранавіцкая ЦЭЦ. У 1960-я г. пабудаваны буйныя ЦЭЦ высокага ціску ў Полацку, Магілёве, Гродне, Бабруйску, пазней Мінская ЦЭЦ-4 і Мазырская ЦЭЦ. Гл. таксама *Электрыфікацыя*.

ЦЕПЛАХО́Д, марское або рачное самаходнае судна, рухачы якога прыводзяцца ў дзеянне *цеплавым рухавіком* (звычайна *дызелем*). Ц. з *газавай турбінай* наз. газатурбаходам (з'явіліся ў 1951, гл. *Турбаход*).

На Ц. магутнасць ад гал. *суднавага рухавіка* на суднавы рухач перадаецца непасрэдна або з дапамогай рэдуктара, часам праз злучальную муфту. У параўнанні з *параходам* Ц. больш эканамічны (з-за меншага ўдзельнага расходу паліва), мае меншыя габарыты сілавой устаноўкі. Першы Ц. пабудаваны ў Расіі (рачны дызель-электраход «Вандал», 1903). У 1934—35 у СССР створаны Ц. на паветр. падушцы (гл. *Судна на паветранай падушцы*), у 1957 — на падводных крылах (гл. *Судна на падводных крылах*). Ц. — найб. пашыраны тып сучасных суднаў (больш за 90% усіх трансп. суднаў). На Беларусі выкарыстоўваецца ў рачным транспарце, некаторыя тыпы Ц. выпускаюцца і рамантуюцца на суднабудаўнічасуднарамонтных з-дах (гл. *Суднабудаванне*).

ЦЕПЛАЭЛЕКТРАЦЭНТРА́ЛЬ (ЦЭЦ), *цеплавая электрастанцыя*, якая выпрацоўвае і адпускае спажыўцам адначасова эл. энергію і цеплату, што атрымліваецца ў выніку частковага выкарыстання адпрацаванай пары. Цепланосьбіт адпускаецца ў выглядзе пары (на тэхнал. патрэбы прамысл. прадпрыемстваў) ці гарачай вады (на ацяпленне і быт, патрэбы). ЦЭЦ абсталёўваюць пераважна *цеплафікацыйнымі турбінамі*.

Камбінаваная выпрацоўка эл. і цеплавой энергіі на ЦЭЦ павышае ккдз электрастанцыі і паніжае сабекошт энергіі. У краінах СНД

Ц. — адна з асн. крыніц цэнтралізаванага *цеплазабеспячэння*. Да найб. пашыраных адносяцца паратурбінныя ЦЭЦ (гл. *Цеплавая паратурбінная электрастанцыя*). Выкарыстоўваюцца таксама газатурбінныя ЦЭЦ (гл. *Газатурбінная электрастанцыя*) і камбінаваныя — парагазавыя, на якіх выкарыстоўваюць газавыя і паравыя турбіны. Магутнасць ЦЭЦ да 400 МВт і больш. На Беларусі найбольшыя *мінскія ЦЭЦ*, ЦЭЦ у Наваполацку, Віцебску, Гомелі, Гродне, Магілёве (гл. *Беларуская энергетычная сістэма*).

ЦЕПЛАЭНЕРГЕ́ТЫКА, галіна *цеплатэхнікі*, што займаецца пераўтварэннем цеплаты ў інш. віды энергіі. Для пераўтварэння цеплаты ў мех. энергію выкарыстоўваюць цепласілавыя ўстаноўкі, асн. часткі якіх *цеплавыя рухавікі*. Атрыманая мех. энергія прыводзіць у дзеянне рабочыя машыны розных відаў ці электрамех. генератары, што вырабляюць эл. энергію. Для прамога пераўтварэння цеплаты ў эл. энергію служаць *тэрмаэлектрычныя генератары, тэрмаэмісійныя пераўтваральнікі энергіі, магнітагідрадынамічныя генератары*.

Аснова сучаснай Ц. — стацыянарныя *цеплавыя паратурбінныя электрастанцыі*, што вырабляюць асн. частку эл. энергіі. Для энергазабеспячэння магістральных газаправодаў і пакрыцця пікавых нагрузак выкарыстоўваюцца *газатурбінныя электрастанцыі*. Акрамя асн. крыніцы электразабеспячэння — раённых кандэнсацыйных электрастанцый — дзейнічаюць *цеплаэлектрацэнтралі*. Атрымалі пашырэнне *парагазатурбінныя ўстаноўкі*, што даюць магчымасць паменшыць удзельны расход цяпла на вытв-сць электраэнергіі. У раёнах, аддаленых ад ЛЭП, крыніца электраэнергіі — *дызельныя электрастанцыі*. Трансп. цепласілавыя эл. станцыі з поршневымі *рухавікамі ўнутранага згарання* выкарыстоўваюцца на цеплавозах, аўтамабілях і інш.

В.Р.Баштавой.

ЦЕПЛАЭНЕРГЕТЫ́ЧНЫ БЕЛАРУ́СКІ ІНСТЫТУ́Т (БелЦЭІ), навукова-даследчае і праектнае рэсп. унітарнае прадпрыемства. Засн. ў 1964. Дзейнічаюць 17 асн. падраздзяленняў. Віцебскі і Наваполацкі філіялы, лабараторыя кіравання паліўна-энергет. рэсурсамі. Пры ін-це створаны Рэсп. цэнтр паліўна-гарэлачных устройстваў і аховы атмасферы. Асн. кірункі даследаванняў і дзейнасці: распрацоўка, праектаванне і ўкараненне АСК тэхнал. працэсамі на цеплавых і атамных электрастанцыях, у цеплавых і электрычных сетках, сістэм тэхн. дыягностыкі абсталявання цеплавых і атамных электрастанцый; распрацоўка метадаў, арганізацыя выпуску і ўкараненне шматузроўневых сістэм уліку энергіі; укараненне энергазберагальных тэхналогій у энергетыцы і інш. галінах; праектаванне кацельных, мініЦЭЦ, сістэм кіравання; распрацоўка, праектаванне, выпрабаванне, арганізацыя вытв-сці топачна-гарэлачных устройстваў, іх атэстацыя і сертыфікацыя. Распрацоўкі БелЦЭІ выкарыстоўваюцца ў АСК Лукомскай і Бярозаўскай ДРЭС, Магілёўскай і Бабруйскай ЦЭЦ-2, Экібастузскай ДРЭС-2, Маскоўскай ЦЭЦ-21, Малд. ДРЭС і інш. У ін-це працавалі д-ры тэхн. навук У.С.Ермакоў, А.К.Унукаў, Г.І.*Хуцкі*, працуюць Я.П.*Забела*, У.Х.Сап'янік, І.І.Стрыха.

ЦЕ́ПЛЕНЬ, вёска ва Уздзенскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 43 км на ПнУ ад г. Узда, 45 км ад Мінска, 20 км ад чыг. ст. Рудзенск. 259 ж., 104 двары (2003). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. На паўн. ускраіне вёскі гарадзішча культуры штрыхаванай керамікі тыпу верхняга пласта Банцараўшчыны і ранняга феадалізму.

ЦЕ́ПЛІЦЫ (Teplice), горад на ПнЗ Чэхіі, у Рудных гарах, 53 тыс. ж. (1991). Прам-сць: дакладнае машынабудаванне, хім., шклокерамічная, тэкстыльная. У раёне Ц. — здабыча бурага вугалю. Бальнеалагічны курорт.

ЦЕРАБУ́Н Уладзімір Васілевіч (н. 11.4.1946, в. Несцяняты Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. скульптар, графік. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1973). У 1979—86 старшыня Гродзенскай абл. арг-цыі Саюза мастакоў Беларусі, у 1987—99 выкладаў у Гродзенскім вучылішчы мастацтваў. Працуе ў станковай і манум. скульптуры, графіцы. Аўтар мемар. комплексу *Дальва* (1973, прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1976), помніка на вайск. могілках у Гродне (1981), рэльефаў «Фантазія», «Гімн сонцу», кампазіцый дэкар. «Крылатая» (1989), «Ветразь» (1992), аб'ёмнапрасторавых (1991); цыкла «Скульптура малых форм «Ракурс» (1990—2002), серыі керамічных пасудзін (1993—98), графічнага цыкла «Ракурс» (1986—96). Сярод станковых кампазіцый: «Расстраляная песня. Памяці В.Хары» (1976), «Летапісец» (1981), «Сымон-музыка», «Апошняе жніво» (абедзве 1982), «Непераможныя» (1985), «Ясь і Яніна» (1987), «Апосталы Пётр і Павел» для касцёла св. Андрэя ў г. Слонім Гродзенскай вобл., «Госпадзі, веру табе» для бернардзінскага касцёла ў Гродне (1996), «Флора і фауна» (1997), «Мельпамена» (2001), «Элегія» (2003).

У.**Церабун**. Кампазіцыя «Ветразь». Гродна. 1992.

Л.Ф.Салавей.

ЦЕРАБЯНЁЎ Аляксандр Іванавіч (21.1.1815, С.-Пецярбург — 12.8.1859), рускі скульптар; прадстаўнік позняга класіцызму. Вучыўся ў С.-Пецярбургскай АМ (1824—36). Удзельнічаў у афармленні грамадскіх будынкаў С.-Пецярбурга, у т.л. Апякунскага савета, Выхаваўчага дома, у аднаўленні інтэр'ераў Зімняга палаца пасля пажару 1837; найб. значная работа — 10 атлантаў у порціку Новага Эрмітажа (1844—49). Выконваў рэаліст. партрэты.

ЦЕРАЗДРЭ́Ў, другая назва ракі *Ханя* ў Нараўлянскім р-не Гомельскай вобл.

ЦЕРАСПАЛО́СІЦА, раз'яднанасць і раздробленасць зямлі аднаго землекарыстальніка на некалькі адасобленых частак. Бывае міжгаспадарчая, між- і ўнутрысялібная. У эпоху феадалізму была пашырана ў ВКЛ і Расіі. Узмацнілася ў выніку сял. рэформы 1861. Памешчыкі часта пакідалі сабе зямельныя ўчасткі, размешчаныя сярод сял. надзелаў, каб прывязаць сялян да сваёй гаспадаркі. Вялікае пашырэнне мела ўнутрыабшчынная Ц. Надзел, які належаў дзвюм і болей сем'ям, разбіваўся на шэраг дробных частак, раскіданых палосамі, у розных месцах, нярэдка на значнай адлегласці ад сядзібы і адна ад адной. Пры Ц. паніжалася інтэнсіфікацыя сял. і панскай гаспадарак. Ліквідавана ў выніку нацыяналізацыі зямлі і калектывізацыі с.-г. вытв-сці.

В.П.Панюціч.

ЦЕ́РАХАВА Маргарыта Барысаўна (н. 25.8.1942, г. Турынск Свярдлоўскай вобл., Расія), расійская актрыса. Засл. арт. Расіі (1976). Вучылася ў Ташкенцкім ун-це (1959—61). Скончыла Школу-студыю пры Т-ры імя Массавета (1964), у 1964—83 і з 1987 працуе ў гэтым т-ры. Яе творчасці ўласцівы дакладнасць псіхал. аналізу, стрыманы лірызм, шчырасць, непасрэднасць: Клеапатра («Цэзар і Клеапатра» Б. Шоу), Віржыні Вальтэр («Мілы друг» Г. дэ Мапасана), Мары («Вачыма клоуна» паводле Г.Бёля), Соня («Злачынства і кара» паводле Ф.Дастаеўскага), Лізавета («Царскае паляванне» Л.Зорына), Любоў Сяргееўна («Тэма з варыяцыямі» С.Алёшына) і інш. З 1966 здымаецца ў кіно: «Бягучая па хвалях» (1967), «Беларускі вакзал» (1971), «Маналог» (1973), «Люстра», «На ўсё астатняе жыццё» (абодва 1975), «Дзённы цягнік» (1976), «Сабака на сене» (1977), «Д'Артаньян і

тры мушкецёры» (1978), «Давай пажэнімся» (1983), «Яно» (1989), «Толькі для вар'ятаў» (1990), «Каралі расійскага вышуку» (1996) і інш. Выступае як рэжысёр.

Літ.: Актеры советского кино. Вып. 12. М., 1976.

ЦЕРАХО́ЎКА, гарадскі пасёлак у Добрушскім р-не Гомельскай вобл., на р. Вуць, чыг. ст. на лініі Гомель—Бахмач (Украіна). Аўтадарогі на Добруш, Гомель, Дабранку. За 30 км ад г. Добруш. 3,2 тыс. ж. (2003). Прадпрыемствы пач. апрацоўкі лёну, буд. матэрыялаў, харч. прам-сці. 2 сярэднія, муз. і спарт. школы, 2 дамы культуры, 3 б-кі, бальніца, паліклініка, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Царква. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнікі землякам, настаўнікам і вучням, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

Як вёска вядома ў Рэчыцкім пав. ВКЛ з 1772 у Рас. імперыі. У 1776 у складзе Гомельскага маёнтка падаравана рас. урадам ген.-фельдмаршалу П.А.Румянцаву. Уваходзіла ў Клімаўскі фальварак Бешцкага пав. У 1831 у Ц. 469 рэвізскіх душ. З 1834 ва ўладанні кн. І.Ф.Паскевіча. З 1852 у Чырванабудскай вол. Гомельскага пав. Магілёўскай губ. З пабудовай чыгункі Гомель—Рамны (1874) Ц. — станцыя. У 1886 — 1571 ж., 245 двароў, пач. школа, 4 ветракі, царква. З 1919 у Гомельскай губ. РСФСР, са снеж. 1926 у складзе БССР, у Чырванабудскім р-не. Са жн. 1927 цэнтр *Церахоўскага раёна*. З 27.9.1938 гар. пасёлак; у 1939 — 3,1 тыс. ж. У Вял. Айч. вайну з 23.8.1941 акупавана ням. фашыстамі, якія загубілі ў Ц. і раёне 609 жыхароў. Вызвалена 27.9.1943 65-й арміяй Цэнтр. фронту ў ходзе Чарнігаўска-Прыпяцкай аперацыі. З 25.12.1962 у Добрушскім р-не.

ЦЕРАХО́ЎСКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1927—62. Утвораны 4.8.1927 у Гомельскай акрузе (да 26.7.1930). Цэнтр — г.п. *Церахоўка*. Уключаў 39 сельсаветаў. 30.12.1927 у выніку ўзбуйнення і рэарганізацыі ў раёне зацверджана 19 сельсаветаў. З 20.2.1938 раён у Гомельскай вобл. 25.12.1962 Ц.р. скасаваны; г.п. Церахоўка і сельсаветы перададзены ў Добрушскі р-н.

ЦЕРАШКЕ́ВІЧ Сяргей Рыгоравіч (23.4.1910, с. Чкалаўскае Спаскага р-на Прыморскага краю, Расія — 27.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў курсы мал. лейтэнантаў (1939). У Чырв. Арміі з 1933. У Вял. Айч. вайну з 1941 на фронце. Камандзір роты ст. лейтэнант Ц. вызначыўся 27.6.1944 у баях каля в. Галоўчын Бялыніцкага р-на: рота на чале з ім 26 чэрв. фарсіравала рэкі Бася і Дняпро, захапіла плацдарм, у крытычны момант бою Ц. са звязкай гранат кінуўся пад варожы танк. У с. Чкалаўскае ўстаноўлены бюст Ц.

ЦЕРАШКО́ВА Валянціна Уладзіміраўна (н. 6.3.1937, с. Масленнікава Тутаеўскага р-на Яраслаўскай вобл., Расія), савецкі касманаўт, першая ў свеце жанчына-касманаўт. Герой Сав. Саюза (1963). Лётчык-касманаўт СССР (1963). Ген.-м. авіяцыі (у адстаўцы). Канд. тэхн. н. (1977). Засл. майстар спорту (1963). Бацькі з Беларусі. Скончыла Яраслаўскі тэхнікум лёгкай прам-сці (1960), Ваенна-паветр. інж. акадэмію імя Жукоўскага (1969). У 1962—97 у Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў імя Гагарына. 16—19.6.1963 здзейсніла палёт на касм. караблі (КК) «Усход-6»

С.Р.Церашкевіч.

В.У.Церашкова.

(групавы палёт з КК «Усход-5», касманаўт В.Ф.*Быкоўскі*). У космасе правяла 2,95 сут. Залаты медаль імя Цыялкоўскага АН СССР. Імем Ц. названы кратэр на Месяцы і малая планета № 1671 («Чайка»). З 1968 старшыня К-та сав. жанчын, у 1987—92 — Прэзідыума Саюза сав. т-ваў дружбы і культ. сувязей з замежнымі краінамі, з 1994 — Рас. цэнтра міжнар. навук. і культ. супрацоўніцтва пры ўрадзе Рас. Федэрацыі.

Тв.: Вселенная — открытый океан! М., 1964.

Літ.: Попов Л.И., Касьян И.И., Кузьмичев Н.А. Четверо из космической семьи. М., 1991. *У.С.Ларыёнаў.*

ЦЕРАШКО́ВІЧ Павел Усеваладавіч (н. 25.7.1958, г. Севастопаль, Украіна), бел. этнограф. Канд. гіст. н. (1988). Скончыў БДУ (1980). З 1979 працаваў у Бел. музеі нар. архітэктуры і побыту, з 1981 у Мін-ве культуры Беларусі, у 1982—83 у Дзярж. музеі Беларусі, з 1986 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, з 1991 у БДУ (з 2001 заг. кафедры), адначасова ў 1994—95 выкладаў у Хельсінкскім ун-це і ў 1999 ва ун-це імя М.Кюры-Складоўскай у г. Люблін (Польшча). Даследуе этн. гісторыю Беларусі, Цэнтр. і Усх. Еўропы 19 — пач. 20 ст., гісторыю нац. меншасцей Беларусі, тэорыю этнічнасцей і нацыяналізму. Аўтар раздзелаў у кнігах «Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя» (1985), «Палессе: Матэрыяльная культура» (1988), «Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі» (1990), «Падручніка па гісторыі Беларусі» (на ням. мове, 2001), артыкула «Беларусы» ў амер. «Энцыклапедыі сусветнай культуры» (1994) і інш. Аўтар і складальнік зб. дакументаў «Грамадзянскія рухі ў Беларусі, 1986—1991» (1991).

ЦЕРАШКО́Ў Аляксей Дзмітрыевіч (18.2.1893, в. Карма Добрушскага р-на Гомельскай вобл. — 18.3.1960), Герой Сав. Саюза (1945), ген.-лейтэнант (1945). Скончыў курсы «Выстрал» (1922) і ўдасканаленні каманднага саставу пры Ваен. акадэміі імя Фрунзе (1941). У арміі з 1914, у Чырв. Арміі з 1918. Удзельнік 1-й сусв. і грамадз. войнаў, баёў на Зах. фронце ў 1919—20 (камандзір роты, батальёна, палка), вайны ў Іспаніі 1936—39. У Вял. Айч. вайну на фронце з 1941 — камандзір брыгады, дывізіі, корпуса. Дывізія на чале з ім вызначылася пры абароне г. Тула ў 1941; 14.1.1945 стралк. корпус пад камандаваннем ген.-маёра Ц. прарваў абарону праціўніка на левым беразе р. Вісла (Польшча), фарсіраваў р. Варта, за 15 дзён з баямі прайшоў 400 км і ўступіў на тэр. Германіі. Да 1953 на камандных пасадах у Сав. Арміі.

ЦЕРАШКО́Ў Іван Іосіфавіч (н. 30.10.1922, г. Гомель), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1975), праф. (1982). Скончыў Мінскую вышэйшую парт. школу (1948). З 1949 на камсамольскай і парт. рабоце, выкладаў эканам. тэорыю ў розных ВНУ Мінска. З 1962 у Бел. ін-це нар. гаспадаркі (у 1966—71 заг. кафедры). У 1984—93 у БДУ. Навук. працы па праблемах развіцця эканам. сістэмы грамадства, тэорыі і практыкі ажыццяўлення гасп. рэформы.

Тв.: Вопросы теории и практики хозяйственной реформы. Мн., 1970; Принципы социалистического хозяйствования. Мн., 1972; Экономические условия образования общенародной коммунистической собственности. Мн., 1973.

ЦЕРАШЧА́ТАВА Вольга Васілеўна (24.7.1926, г.п. Лоеў Гомельскай вобл. — 30.3.1992), бел. мастацтвазнавец. Канд. мастацтвазнаўства (1968). Скончыла Маскоўскі паліграф. ін-т (1961). З 1966 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі (з 1978 заг. сектара і Музея стараж.-бел. культуры). Даследавала бел. і стараж.-бел. выяўл. мастацтва. Складальнік, аўтар артыкулаў і ўступаў кн. «Музей старажытнабеларускай культуры: Каталог экспазіцыі» (1983), «Помнікі старажытнабеларускай культуры: Новыя адкрыцці» (1985). Адзін з аўтараў «Гісторыі мастацтва народаў СССР» (т. 8, 1977), «Гісторыі беларускага мастацтва» (т. 1—4, 1987—90).

Тв.: Беларуская кніжная графіка 1917—1941. Мн., 1978; Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI—XVIII стст. Мн., 1986.

ЦЕРНАВА́Я (Бойчанка) Галіна Гаўрылаўна (13.4.1928, г. Паўладар, Казахстан — 1990), бел. юрыст. Д-р юрыд. н. (1974), праф. (1975). Скончыла Маскоўскі ін-т міжнар. адносін (1951). З 1957 у МЗС, з 1960 у БДУ. З 1976 выкладала ў ВНУ Масквы. Навук. працы па дзярж. і міжнар. праве.

Тв.: Конституция США: Толкование и применение в эпоху империализма. М., 1959; Политическая организация США: Общественные институты и их взаимодействие с государством. Мн., 1970.

ЦЕРНАВО́Й Алег Сяргеевіч (н. 12.9.1933, г. Туркменабат, Туркменістан) бел. філосаф. Д-р філас. н. (1976), праф. (1977). Засл. дз. нав. Беларусі (1982). Скончыў Маскоўскі ін-т міжнар. адносін (1957). З 1957 у МЗС Беларусі. З 1961 у Бел. пед. ун-це (у 1973—2003 заг. кафедры). Навук. працы па праблемах сац. філасофіі, этыкі, паліт. сістэмы грамадства, методыкі выкладання філасофіі і грамадазнаўчых навук. Аўтар прац па гісторыі кубінскай філасофіі, у т.л. пра Х.Марці; яго кніга «Філасофія на Кубе (1790—1878 гг.)» апубл. ў Гаване (1981).

Тв.: Хосе Марти. М., 1966; Исторический материализм. Мн., 1970 (у сааўт.); Философия Кубы (1790—1878 гг.). Мн., 1972; Pensar es servir a la humanidad // Anuario martiano. La Habana. 1976. № 6; Concepciones filosoficas de la lucha por la independencia en Cuba (1790—1878) // En de libro: La Historia de Cuba. M., 1978. T. 1; Философия. 2 изд. Мн., 1998 (у сааўт.); Альтернативы развития политической системы Республики Беларусь в XXI в.: методол. аспект пробл. // Политическая система Беларуси: достижения, пробл., возможности совершенствования. Мн., 2001.

ЦЕ́РНІЦА, м я л к а, традыцыйная сялянская прылада для першаснай апрацоўкі (мяцця) ільняной ці канаплянай тресты. На Беларусі вядомы 2 асн. тыпы Ц.: нахільная (Пн, У) і гарыз. (ПнЗ, ПдУ), 1- і 2-рэбравыя. Выраблялі іх звычайна са ствала дрэва даўж. больш за 1,5 м, выкапанага з каранямі, якія з аднаго канца служылі ножкамі (другі канец ляжаў на зямлі). У ствале па даўжыні выдзёўбвалі жолаб, у які ўстаўлялася 1- ці 2-рэбравае біла. Гарыз. Ц. складалася з 2 або 3 гарызантальна ўмацаваных на стойках дошчачак (шчок), у адтуліну паміж якімі зверху заходзіла біла (язычок). У наш час выйшлі з ужытку. *Г.М.Курыловіч.*

Церніца.

«ЦЕ́РНІЦА», старажытны бел. народны танец. Муз. памер 2/4. Тэмп умераны. Асобныя элементы танца імітавалі мяцце лёну на церніцы. Мелодыя і прыпеўкі да танца запісаны ў 1940-я г. Г.Цітовічам у в. Засімы Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл. У 1970-я г. І.Назіна ў в. Гарадзец Столінскага р-на Брэсцкай вобл. выявіла польку з назвай «Ц.» з той жа інтанацыйнай асновай. *Л.К.Алексютовіч.*

ЦЕРПІЛО́ЎСКІ Канстанцін Феліксавіч (25.11.1931, г. Гомель — 29.5.1999), бел. вучоны ў галіне механізацыі жывёлагадоўлі. Д-р тэхн. н. (1982), праф. (1987). Скончыў БПІ (1955). З 1961 у Цэнтр. НДІ механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі ў Мінску (з 1979 заг. лабараторыі). У 1986—98 заг. кафедры Бел. агр. тэхн. ун-та. Навук. працы па механізацыі тэхнал. працэсаў нарыхтоўкі кармоў. Распрацаваў тэорыю малекулярнага фракцыянавання харч. і кармавых вадкасцей з дапамогай паўпранікальных мембран, тэхналогіі вытв-сці пратэінавых канцэнтратаў і тэрмічнай сушкі кармоў.

Тв.: Механизация переработки картофеля на кормовые цели. Мн., 1987 (разам з У.В.Маёнавым, У.М.Савіных); Интенсивные технологии приготовления кормов. Мн., 1989 (у сааўт.). *Л.В.Бароўка.*

ЦЕ́РСКА-КУ́МСКАЯ НІЗІ́НА. У Перадкаўказзі, у паўд.-зах. ч. Прыкаспійскай нізіны (Расія). Выш. да 100 м (усх. палавіна ніжэй узр. акіяна). Нізіна дзеліцца на 3 ч.: Прыкумскую раўніну (на Пн), масіў Церска-Кумскіх пяскоў (на Пн ад р. Церак), дэльту рэк Церак і Сулак (на ПдУ). Паўпустынная раслінасць, у паніжэннях дэльты — плаўні. Пашавая жывёлагадоўля.

ЦЕ́РСКА-КУ́МСКІ КАНА́Л, арашальна-абвадняльны канал на Паўн. Каўказе, у Расіі. Адкрыты ў 1961. Падае ваду р. Церак у р. Кума. Даўж. 150 км. 39 гідратэхн. збудаванняў, прапускная здольнасць 100 м^3/с.

ЦЕ́РСКА-СУ́НЖЭНСКАЕ ЎЗВЫ́ШША У Перадкаўказзі, паміж рэкамі Сунжа і Церак (Расія). Уключае 2 шыротныя хрыбты — Церскі (выш. да 664 м) і Сунжэнскі (выш. да 926 м), падзеленыя Алханчуртаўскай далінай. Складзена з пясчана-гліністых адкладаў і пясчанікаў з покрывам з лёсападобных суглінкаў. Пераважаюць стэпы. Радовішчы Грозненскага нафтавага р-на.

ЦЕРУХА́, рака ў Добрушскім і Гомельскім р-нах, левы прыток р. Сож (бас. р. Дняпро). Даўж. 57 км. Пл. вадазбору 525 км^2. Пачынаецца за 2 км на ПдУ ад пас. Альховае Добрушскага р-на, вусце за 4 км на З ад в. Церуха Гомельскага р-на. Цячэ па ўсх. ускраіне Гомельскага Палесся. Даліна пераважна выразная. Пойма двухбаковая (шыр. да 2 м), часткова асушаная. Рэчышча на вял. працягу каналізаванае (шыр. да 10 м). Берагі стромкія, выш. да 3 м. Замярзае ў канцы 2-й дэкады снеж., крыгалом у сярэдзіне сакавіка. Прымае сцёк меліярац. каналаў. Некалькі шлюзаў рэгулююць яе водны рэжым. Уздоўж ракі зона адпачынку Церуха.

Рака Церуха.

ЦЕРУХА́, вёска ў Гомельскім р-не, на р. Церуха, на аўтадарозе Гомель—Чарнігаў (Украіна). Цэнтр сельсавета. За 21 км на Пд ад Гомеля, 7 км ад чыг. ст. Церуха. 809 ж., 272 двары (2003). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Свята-Мікольскі манастыр. Брацкая магіла сав. воінаў і ахвяр фашызму.

ЦЕСАКО́Ў Кім Дзмітрыевіч (н. 20.2.1936, г. Чэрвень Мінскай вобл.), бел. кампазітар, педагог. Засл. дз. маст. Беларусі (1998). Скончыў Новасібірскую кансерваторыю (1965). З 1966 выкладаў у Бел. кансерваторыі і ў 1972—96 у спец. муз. школе пры ёй. У 1969—71 заг. рэдакцыі ў выд-ве «Беларусь». Працуе ў розных жанрах. Для яго музыкі характэрны філасафічнасць, драм. і гераічная вобразнасць, народна-песенныя інтанацыі. Значнае месца займае музыка для дзяцей і юнацтва. Сярод твораў: опера «Барвовы золак» (радыёпаст. 1978), «Палын — трава горкая» (1987); 7 сімфоній (1966—2000), у т.л. 7-я для вял. духавога аркестра; 10 стр. квартэтаў (1967—93); канцэрты для цымбалаў (1974, 1986), габоя (1985) і для 3 труб і вял. літаўры (1997) з аркестрам; кантаты, у т.л. «Купалле» (1991); араторыі, у т.л. «Хатынь» (1973); камерна-інстр. музыка; вак. і хар. цыклы; песні, музыка для драм. т-ра, кіно.

Літ.: Л у к ш а В. Людзям — шчодрасць сэрца // Лукша В. Дзесяць дарог да чароўнага. Мн., 1970; З у б р ы ч І.І. Ігар Лучанок. Кім Цесакоў. Мн., 1973. *Т.А.Дубкова.*

ЦЕСНАВА́Я 1-я, вёска ў Стаўбцоўскім р-не Мінскай вобл., на аўтадарозе Івянец—Дзераўная—Стоўбцы. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 55 км на ПнЗ ад горада і чыг. ст. Стоўбцы, 75 км ад Мінска. 302 ж., 110 двароў (2003). Сярэдняя школа, б-ка, амбулаторыя, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Касцёл св. Максіміліяна.

ЦЕСНЯКІ́, цесныя сацыялісты, назва ў 1903—19 балг. сацыял-дэмакратаў, якія вылучыліся з Балг. рабочай с.-д. партыі і ўтварылі ўласную Балг. рабочую с.-д. партыю (цесных сацыялістаў) — БРСДП (ц.с.). Лідэры: Дз.*Благоеў*, В.Каларaў, Г.*Дзімітроў*. Выступалі за згуртаваную, «цесную» партыю (адсюль назва), прытрымліваліся ідэалогіі рэв. *марксізму*, але ў адрозненне ад рас. *бальшавікоў*-ленінцаў не бачылі ў сялянстве саюзніка пралетарыяту, не надавалі важнага значэння дыктатуры пралетарыяту, барацьбу за дэмакратыю не звязвалі з барацьбой за сацыялізм. У час *Балканскіх войнаў 1912—13* і 1-й сусв. вайны займалі антываен., інтэрнацыяналісцкія пазіцыі. Віталі Кастр. рэвалюцыю 1917 у Расіі, удзельнічалі ў стварэнні *Камуністычнага Інтэрнацыянала*. У маі 1919 БРСДП (ц.с.) перайменавана ў Балг. камуніст. партыю (цесных сацыялістаў). Словы «цесных сацыялістаў» захоўваліся ў назве Балг. кампартыі да снеж. 1948.

ЦЕСЦЬ, бацька жонкі; гл. ў арт. *Роднасць і свойства*.

ЦЕХАНАВЕ́ЦКІЯ (у 15—16 ст. Цеханоўскія), магнацкі род герба «Дамброва» ў ВКЛ. Радаслоўную вядуць ад Мацея (Мацкі) Пашкавіча Струмілы, намесніка медніцкага ў 1497, саўладальніка Дмошына і Цеханаўца на Падляшшы (адсюль прозвішча), старэйшага брата родапачынальніка *Кішкаў* Пятра Пашкавіча Струмілы-Цеханавецкага Кішкі. У 18—20 ст. некаторыя прадстаўнікі роду ўжывалі графскі тытул (у 1975 прызнаны за бачэйкаўскай галіной роду ў Італіі, пасля ў Мальтыйскім ордэне). У 15 ст. род валодаў маёнткамі на Падляшшы і ў Мельніцкай воласці, з 1-й пал. 16 ст. іх асн. ўладанні знаходзіліся ва ўсх. Беларусі: Мсціслаўскім і Полацкім ваяв., Віцебскім і Аршанскім пав. Найб. вядомыя:

Нікадзім Янавіч (?—1549), падстолі ВКЛ прыкладна з 1536, адначасова маршалак гаспадарскі з 1546, дзяржаўца крэўскі, староста мельніцкі і ласіцкі, пасол у Маскву ў 1536 і 1541, камісар пры размежаванні Себежскага пав. з Расіяй у 1546. Андрэй Нікадзімавіч (?— паміж 1594 і 1596), сын Нікадзіма Янавіча, першы ў родзе ўладальнік маёнтка Бачэйкава ў Полацкім ваяв. — аднаго з асн. родавых гнёздаў Ц. да 20 ст. Станіслаў Андрэевіч (паміж 1562 і 1565—98), сын Андрэя Нікадзімавіча. Стольнік аршанскі, дэпутат Трыбунала ВКЛ у 1593 і 1596. Крыштоф Станіслававіч (?—1655), сын Станіслава Андрэевіча. Староста мсціслаўскі каля 1650—52, кашталян мсціслаўскі ў 1653—55, ваявода мінскі ў 1655. Мікалай Валяр'ян (?— 1672), сын Крыштофа Станіслававіча. Староста мсціслаўскі з 1652 і опсаўскі, ваявода мсціслаўскі з 1659. 4 разы выбіраўся маршалкам Трыбунала ВКЛ. Альбрыхт Канстанцін (?—12.6.1675), сын Крыштофа Станіслававіча. Староста опсаўскі і аршанскі. У час *вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67* палкоўнік, у 1663 часова камандаваў войскамі ВКЛ, абозны ВКЛ з 1664. Аляксей (Аляксандр?) Хрыстафоравіч. У 1656 выехаў на службу ў Расію, дзе прыняў праваслаўе. У 1664—66 ваявода мезенскі і кеўрольскі. Юзаф (1741 або 1748 — паміж 1801 і 1804), сын Фелікса Нікадзіма. Ген.-ад'ютант ВКЛ (1770), сакратар пасольства Рэчы Паспалітай у С.-Пецярбургу (да 1773). У маёнтку Бачэйкава пабудаваў палац (каля 1769) і школу для сял. дзяцей. Ян Непамуцэн Мартынавіч (?—1808), маршалак дваранства Беларускай губ. ў 1796—97 і 1801, Віцебскай губ. ў 1806—08, правадз. стацкі саветнік. Станіслаў Іосіфавіч (каля 1783 — 30.8.1848), сын Юзафа. Маршалак дваранства Чавускага пав., адзін з буйнейшых землеўладальнікаў усх. Беларусі. Фелікс Хрыстафоравіч (каля 1784 — 24.4.1851), ротмістр, у 1820—25 маршалак дваранства Віцебскай губ. Антон Эдмунд Станіслававіч (1816 — 6.11.1878), сын Станіслава Іосіфавіча. Маршалак дваранства Чавускага пав. ў 1857—63. За ўдзел у паўстанні 1863—64 сасланы ў Сібір, з 1867 у эміграцыі. Ігнат Феліксавіч (15.3.1815, г. Цярэспаль Люблінскага ваяв. — да 1894). За ўдзел у падрыхтоўцы паўстання ў Горках (з жонкай Ізабелай) у 1863 сасланы ў Сібір, вернуты па амністыі. Станіслаў Аляксандр Канстанцін Эмануэль Іосіфавіч (Паўлавіч; 18.12.1853, в. Бачэйкава — 5.1.1918), правадз. стацкі саветнік, дыпламат, з 1908 ген. консул у Марселі. Баляслаў Станіслаў Іосіф Альберт Іосіфавіч (Паўлавіч; 17.3.1857, в. Гопчыца — 3.3.1910), правадз. стацкі саветнік, з 1905 уфімскі губернатар. Уладзіслаў Міхал Стафан Эмануэль Іосіфавіч (Паўлавіч; 25.11.1860, в. Гопчыца — 23.4.1910), правадз. стацкі саветнік, гісторык, краязнавец, аўтар гісторыі 18-га Кляцціцкага драгунскага палка (1886) і гісторыі маёнтка Бачэйкава (1905). Ежы Станіслаў (4.4.1893, Варшава — 6.4.1930), сын Уладзіслава, апошні ўладальнік Бачэйкава, польскі дыпламат.

Прозвішча Ц. з 1-й пал. 16 ст. насілі ў Польшчы нашчадкі Ганны Станіславаўны, унучкі Мацея Пашкавіча, ад шлюбу з шляхціцам Янам Угрынам-Швейкам герба «Тшаска», якія валодалі часткай Цеханоўца і прынялі герб «Дамброва». Дробнамаянткоўы род Ц. (першапачаткова Цеханоўскія, Ціханоўскія) герба «Дамброва» вядомы ў Мсціслаўскім ваяв. (пасля ў Магілёўскай губ.), іх роднасць з магнацкай сям'ёй не даказана.

Літ.: Цехановецкий В.П. Хроника одного поместья: Бочейково. Витебск, 1905.

С.У.Думін.

ЦЕЦЯРО́ЎНІК, ястраб вялікі, ястраб-цецяроўнік (Accipiter gentilis), птушка сям. ястрабіных атр. сокалападобных. Пашыраны ў лясных

Цецяроўнік.

зонах Еўразіі, у т.л. на Беларусі., Паўн. Амерыкі і ў гарах Паўн.-Зах. Афрыкі. Нар. назвы: курадаў, куратнік, вял. шуляк.

Даўж. да 70 см, маса да 2 кг. Самкі буйнейшыя за самцоў. Спіна шаравата-бурая, бруха светлае з бурымі стракацінамі, на хвасце 4 папярочныя бурыя паласы; бываюць альбіносы. Дзюба сіне-бурая з чарнаватай верхавінкай. Ногі жоўтыя. Нясе 2—5 яец. Корміцца птушкамі (часам свойскімі) і дробнымі млекакормячымі.

Э.Р.Самусенка.

ЦЕЦЯРУ́К палявы (Lyrurus tetrix), птушка сям. цецеруковых атр. курападобных. Пашыраны ў лясной і лесастэпавай зонах Еўразіі. На Беларусі звычайны аселы від, найб. шматлікі ў Бел. Паазер'і і Палессі.

Даўж. да 57 см, маса да 1,8 кг. Самкі меншыя. Ц. характэрны палавы *дымарфізм*. Самцы (касачы) чорныя з сінявата-фіялетавым адлівам, брыво чырв., на крыле белая паласа, хвост ліраподобны (адсюль лац. назва роду), падхвосце белае. Такуюць у шлюбны перыяд. Самкі шэрыя, стракатыя. Нясуць 5—14 яец. Корміцца пупышкамі, каташкамі, парасткамі

і насеннем дрэў, ягадамі, збожжам і інш., жывёльным кормам (птушаняты). Аб'ект палявання. *Э.Р.Самусенка.*

ЦЕ́ЧКА, эструс, псіхафізіялагічны стан самак млекакормячых жывёл, які папярэднічае спарванню. Адпавядае перыяду палавой актыўнасці самак і супадае з часам выспявання фалікулаў у яечніках (фалікулярная фаза *палавога цыкла*). Выяўляецца перыядычна (да пакрыцця самкі) з характэрным для кожнага віду жывёл інтэрвалам у некалькі сутак, тыдняў, месяцаў (напр., у пацука — 4—6 сут, каровы — 21 сут). Таксама Ц. наз. адна са стадый вагінальнага цыкла (адпавядае канцу палавога цыкла). Адбываецца выдзяленне клетак эпітэлію похвы, часам з крывацёкам (напр., у сабак).

Цецярук: 1 — самка; 2 — самец.

ЦЕ́ШАЎЛЯ, вёска ў Баранавіцкім р-не Брэсцкай вобл., на аўтадарозе Дзятлава—Баранавічы. Цэнтр сельсавета. За 20 км на ПнЗ ад г. Баранавічы, 210 км ад Брэста, 5 км ад чыг. ст. Мордычы. 630 ж., 262 двары (2003). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЦЕ́ШЧА, маці жонкі; гл. ў арт. *Роднасць і свайцтва.*

ЦЁКЁЙ, Цёкёлі (Thököly) Імрэ (25.9.1657, г. Кежмарак, Славакія — 13.9.1705), кіраўнік вызв. антыгабсбургскай вайны 1678—85 у Венг. каралеўстве. Граф. Айчым *Ракацы Ферэнца II*. У 1678 аб'яднаў і ўзначаліў атрады *куруцаў*, да 1681 вызваліў ад улады *Габсбургаў* 13 паўн.-ўсх. камітатаў (абласцей) Венг. каралеўства, у т.л. ўкр. і славацкія этн. землі, абвясціў сябе ў 1682 іх князем; адначасова прызнаў сябе васалам тур. султана, ад якога атрымаў тытул венг. караля. Збліжэнне Ц. з Турцыяй і выкарыстанне ім тур. ваен. дапамогі падарвала яго папулярнасць. У 1685 княства Ц. захоплена Габсбургамі, сам ён уцёк у Турцыю, дзе да 1690 быў зняволены.

ЦЁМНЫ ЛЕС, вёска ў Дрыбінскім р-не Магілёўскай вобл.; чыг. ст. на лініі Орша—Крычаў. Цэнтр сельсавета. За 12 км на ПдУ ад г.п. Дрыбін, 76 км ад Магілёва. 554 ж., 231 двор (2003). Лясніцтва, унітарнае камунальнае даччынае прадпрыемства «Палівазбыт». Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкія магілы сав. воінаў і партызан. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

«ЦЁПЛЫ ВЕ́ЦЕР» («Föhn»), кодавая назва карнай аперацыі ням. фашыстаў абапал чыгункі Лунінец—Баранавічы (Лунінецкі, Ганцавіцкі, Ляхавіцкі, Клецкі р-ны) 2—23.3.1943 у Вял. Айч. вайну. Праводзілася баявымі групамі Бінца (23, 57, 271-ы паліцэйскія батальёны, батальён «Рускай нацыянальнай народнай арміі», батальён СС Дырлевангера), Грыпа (2-і паліцэйскі полк), Нікеля (13-ы паліцэйскі полк) пад камандаваннем обергрупенфюрэра СС Готберга. Гал. мэты — знішчыць партыз. фарміраванні, што вырваліся з блакады ў час аперацыі *«Русалка»*, — гітлераўцам дасягнуць не ўдалося. За час аперацыі карнікі загубілі больш за 540 сав. грамадзян, захапілі 1226 чал. для вывазу на катаржныя работы ў Германію, разрабавалі і спалілі дзесяткі вёсак, у т.л. Пясчанікі (загубілі 38 чал.) Лунінецкага, Залужжа (60 чал.), Свяціца (106 чал.) Ляхавіцкага р-наў; забралі ў насельніцтва 2890 галоў жывёлы, больш за 7 т ільновалакна, 5 т ільнасемя, 563 т збожжа. На кароткі час гітлераўцам удалося аднавіць рух па чыг. Лунінец—Баранавічы і Пінск—Мікашэвічы.

У.С.Пасэ.

ЦЁРКС І КА́ЙКАС, Цёркс і Кайкас астравы (Turks and Caicos Islands), уладанне Вялікабрытаніі ў паўд.-ўсх. ч. архіпелага Багамскія а-вы ў Атлантычным ак. Уключаюць 2 аднайм. групы астравоў (каля 40 астравоў, з іх 8 населеныя). Пл. 430 км². Нас. 18,7 тыс. чал. (2002). Адм. ц. — Коберн-Таўн на в-ве Гранд-Цёрк. Афіц. мова — англійская. Нац. свята — Дзень канстытуцыі (30 жн.).

Прырода. Астравы нізінныя, складзены з вапнякоў, акаймаваны каралавымі рыфамі. Пашыраны карст. Клімат трапічны, пасатны; дажджлівы перыяд з мая да кастрычніка. Сярэднія месячныя т-ры 23—27 °С, ападкаў больш за 1000 мм. Моцныя вятры, частыя ўраганы. Шмат салёных азёр. Прэснай вады мала. Зараснікі вечназялёных хмызнякоў, гаі какосавых пальмаў.

Насельніцтва. Больш за 90% насельніцтва негры і мулаты. Жывуць таксама англічане і амерыканцы (абслуговы персанал і ваеннаслужачыя ваенна-марской базы ЗША). Вернікі — пераважна пратэстанты (баптысты, метадысты, англікане). Сярэдняя шчыльн. 43,6 чал. на 1 км². У сельскай гаспадарцы і рыбалоўстве занята 20% эканамічна актыўнага насельніцтва, у абслуговых галінах 80%.

Гаспадарка. Аснова эканомікі — абслугоўванне турыстаў, афшорная фін. дзейнасць і рыбалоўства. Валавы ўнутр. прадукт (ВУП) складае 128 млн. дол., каля 7,3 тыс. дол. на 1 чал. (1999). Штогод краіну наведвае каля 93 тыс. турыстаў, пераважна з ЗША. Асн. даход адміністрацыі астравоў — банкаўскі і фін. сектары. На Ц. і К. замежныя кампаніі вызвалены ад падаткаў на прыбытак, адсутнічае кантроль над аперацыямі з валютай. Рыбалоўства мае экспартнае значэнне. Улоў рыбы і марапрадуктаў каля 1,6 тыс. т штогод, у т.л. каля 1 тыс. т лангустаў. На астравах найб. ў свеце ферма па вырошчванні малюскаў. Ёсць невял. рыбакансервавыя прадпрыемствы. Вытв-сць электраэнергіі 5 млн. кВт·гадз (2000). Здабыча солі. Саматужныя промыслы. Магчымасці сельскай гаспадаркі абмежаваны беднасцю глеб і недахопам вады. Апрацоўваецца каля 2% плошчы. Вырошчваюць кукурузу, бабовыя, маніёк, какосы, цытрусавыя, агародніну. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней. Птушкагадоўля. Унутр. транспарт аўтамабільны. Даўж. аўтадарог 121 км. Гал. парты: Коберн-Таўн, Провідэнсьялес. 8 аэрапортаў, у т.л. 4 міжнар. (на а-вах Гранд-Цёрк, Саўт-Кайкас, Норт-Кайкас, Провідэнсьялес). Экспарт (13,7 млн. дол., 1999) амараў, лангустаў, марскіх ракавін. Імпарт (175,6 млн. дол., 1999) прадуктаў харчавання, тытуню, паліва, прамысл. тавараў, буд. матэрыялаў. Гал. гандл. партнёры: ЗША, Вялікабрытанія. Грашовая адзінка — долар ЗША.

Гісторыя. Астравы адкрыты іспанцамі ў 1512, у 17 ст. заселены каланістамі з Багамскіх а-воў. З 1766 уладанне Вялікабрытаніі. У 1874—1962 у адм. падпарадкаванні Ямайкі. У 1959 астравы атрымалі ўнутр. самакіраванне, 30.8.1976 прынята канстытуцыя. На в-ве Гранд-



Цёрк базы ВВС і ВМС ЗША. На выбарах у Заканад. сход 4.3.1999 перамагла партыя Нар. дэмакр. рух (правячая з 1995). Губернатар са студз. 2000 М.Джонс, гал. міністр са студз. 1995 Д.Тэйлар. Паліт. партыі: Нар. дэмакр. рух і Прагрэс. нацыянальная партыя. Дзейнічае Прафсаюз прамысл. рабочых Сент-Джорджэса. *Л.В.Лоўчая* (прырода, насельніцтва, гаспадарка).

ЦЁРН, с л і в а к а л ю ч а я (Prunus spinosa), кветкавая расліна сям. ружавых. Пашыраны ў Еўропе, Зах. Азіі і Паўн. Амерыцы. На Беларусі трапляецца на палянах, узлесках і ярах; занесены ў Чырв. кнігу.

Калючы куст, радзей дрэўца выш. 4—8 м. Лісце прадаўгавата-авальнае, зубчаста-пальчатае, цёмна-зялёнае, матавае, скурыстае. Кветкі белыя, дыям. да 2 см, адзіночныя, распускаюцца да паяўлення лісця. Плод — чорна-сіняя, з шызым налётам касцянка. Плады з

Цёрн.

глыбокай старажытнасці ўжываліся ў ежу, маюць 5,5—8,8% цукроў (глюкоза і фруктоза), 0,8—2,8% арган. к-т. Выкарыстоўваюцца ў сушаным і перапрацаваным (варэнне) выглядзе, з іх атрымліваюць (як і з каранёў) фарбу. Драўніна прыдатная для дробных вырабаў. Культывуюць як прышчэпу (зіма- і засухаўстойлівы). Меданосная, дэкар. расліна.

ЦЁРНЕР (Turner) Нат (2.10.1800, графства Саўтхемптан, штат Віргінія, ЗША — 11.11.1831), баптысцкі прапаведнік у ЗША, негр-нявольнік. Лічыў сябе выканаўцам божай волі і выступаў з пропаведзямі супраць рабства. У жн. 1831 арганізаваў і ўзначаліў паўстанне неграў-нявольнікаў у графстве Саўтхемптан на Пд штата Віргінія. Паўстанцы (каля 70 чал.), узброеныя сякерамі і косамі, знішчалі рабаўладальнікаў і іх маёнткі. Неўзабаве разбіты федэральнымі войскамі. 30.10.1831 Ц. схоплены і з 19 паплечнікамі павешаны. У турме прадыктаваў журналісту гісторыю свайго жыцця. Нягледзячы на нязначныя маштабы, паўстанне Ц. набыло шырокі грамадскі рэзананс і стала штуршком для разгортвання руху супраць рабства неграў ва ўсіх штатах ЗША (гл. *Абаліцыянізм*).

ЦЁСТА, возера ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Аўсянка (цячэ праз возера), за 35 км на ПнУ ад г. Гарадок, каля в. Сяло. Пл. 5,35 км^2, даўж. 6,25 км, найб. шыр. 1,1 км, найб. глыб. 11,7 м, даўж. берагавой лініі 21,4 км. Пл. вадазбору 426 км^2. Катлавіна складанага тыпу, выцягнута з Пн на Пд, падзяляецца на тры плёсы: паўн. мелкаводны, цэнтр. з найб. глыбінёй і паўд. з глыб. да 8 м. Схілы катлавіны невысокія, разараныя, на У і Пд забалочаныя, на З, ПнЗ і ПдУ выш. да 8 м, параслі лесам. Берагі нізкія, пясчаныя, на Пд забалочаныя, ва ўсх. заліве сплавінныя. Дно на глыб. да 2—2,5 м пясчанае, ніжэй ілістае, у паўн.-ўсх. частцы сапрапелістае. Расліннасць пашырана да глыб. 2,4 м. У паўн.-ўсх. і паўд. заліваў расце рэдкі ахоўны від — вадзяны арэх. Упадаюць 6 ручаёў і р. Марысіна.

Возера Цёста.

ЦЁТКА (сапр. П а ш к е в і ч Алаіза Сцяпанаўна; 15.7.1876, фальварак Пешчын, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. — 17.2.1916), бел. паэтэса-рэвалюцыянерка. Скончыла Віленскае 7-класнае вучылішча В.Прозаравай (1901). Настаўнічала ў вёсцы. У 1902—04 вучылася на курсах П.Лесгафта, у 1904 здала экстэрнам экзамены за курс Аляксандраўскай жан. гімназіі ў Пецярбургу. Вярнуўшыся ў Вільню, працавала фельчарам у Нова-Вілейскай бальніцы. Адна з заснавальнікаў і кіраўнікоў *Беларускай сацыялістычнай грамады*. Арганізоўвала рэв. рабочыя гурткі, пісала вершы, якія распаўсюджваліся як рэв. пракламацыі, выступала з прамовамі па-беларуску на мітынгах і сходах. У 1905 была дэлегаткай ад віленскіх работніц на з'ездзе жанчын у Маскве, актыўна ўдзельнічала ў рэв. маніфестацыях у Вільні, у падзямеллі бальніцы трымала шапірограф. Каб пазбегнуць суд. адказнасці, у канцы 1905 эмігрыравала ў Галіцыю (тады ў складзе Аўстра-Венгрыі). Жыла ў Львове, вучылася на філас. ф-це Львоўскага ун-та. У 1906 у Жоўкве (каля Львова) у друкарні базыльянскага манастыра надрукавала зб-кі рэв. вершаў «Хрэст на свабоду» і «Скрыпка беларуская». Нелегальна прыязджала на радзіму, удзельнічала ў выданні газ. *«Наша доля»*, у 1-м яе нумары надрукавала апавяд. «Прысяга над крывавымі разорамі». Захварэла на сухоты і выехала ў Закапанэ (Польшча). У 1908—09 жыла ў Кракаве, вучылася на гуманіт. аддз. Ягелонскага ун-та, была чл. рэв. арг-цыі моладзі ун-та «Спуйня» («Згуртаванасць»). Дзеля атрымання навук. ступені выканала працу «Батлейкі на Беларусі і іх сувязь з польскай драматычнай літаратурай». У 1911 выйшла замуж за С.Кайрыса і вярнулася на радзіму. З тэатрам І.Буйніцкага як актрыса ездзіла па Беларусі. У 1912 у Вільні, Нова-Вілейцы і Лідзе арганізавала некалькі тайных бел. школ. У 1914 у Мінску заснавала і рэдагавала 1-ы бел. часопіс для дзяцей і моладзі *«Лучынка»*. У час 1-й сусв. вайны сястра міласэрнасці ў тыфозным салдацкім бараку ў Вільні.

Пісаць пачала ў 1902 пад уплывам Ф.Багушэвіча. У «Каляднай пісанцы на 1904 год» і «Вялікоднай пісанцы» (абедзве 1904) надрукавала вершы «Мужыцкая доля», «Мужык не змяніўся», «Нямаш, але будзе», «Музыкант беларускі», прасякнутыя спачуваннем цяжкай долі селяніна. Шырока карысталася нар.-песеннай сімволікай (вобразы музыкі, скрыпкі, дудкі). Для твораў перыяду рэвалюцыі 1905—07 характэрны публіцыстычная завостранасць, рэв. пафас, прамоўніцкія інтанацыі, метафарычнасць і алегорыя. Вершы «Мора», «Хрэст на свабоду», «Вера беларуса» і інш. сталі хрэстаматыйнымі. Упершыню ў бел. паэзіі стварыла вобраз рабочага («Пад штандарам»). Асобны перыяд у яе творчасці складалі вершы 1908—14, дзе пераважалі матывы грамадз. журбы і смутку, тугі па радзіме, выявілася засяроджанасць на долі адзінокага чалавека, зварот да фальклору, вобразаў («З чужыны», «Грайка», «На магіле», «На чужой старонцы», «Арлы-брацця, дайце скрыдлы», «Сірацінка», «Вясковым кабетам», «Гаданне» і інш.). Ц. адна з пачынальніц бел. прозы. Яе апавяданні прасякнуты гуманізмам, спачуваннем да чалавека працы, непрыняццем несправядлівасці («Навагодні ліст», «Зялёнка», «Міхаська», «Асенніе лісты», «Лішняя»). Выступала як публіцыст (арт. «Наша народная беларуская песня», «Як нам вучыцца», «Папараць-кветка» і інш.), нарысіст («Успаміны з паездкі ў Фінляндыю», «З дарогі»), даследчыца гісторыі бел. нар. т-ра (брашура «Праграма для збірання матэрыялаў аб батлейках на Беларусі», Вільня, 1910). Звярталася да моладзі з заклікам шанаваць родную мову, рыхтаваць сябе да грамадскай работы («Да вясковай моладзі беларускай», «Шануйце роднае слова!», «Аб душы маладзёжы»). Аўтар «Першага чытання для дзетак беларусаў» (1906). Помнікі Ц. пастаўлены ў г. Шчучын, г.п. Астрына і ў в. Шастакоў-

цы Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл.

Тв.: Творы. Мн., 1976; Выбр. творы. Мн., 2001.

Літ.: А. [Навіна А.] Памяці «Цёткі»: (У гадаўшчыну смерці) // Гоман. 1917. 6 лют.; Хлябцэвіч Я. Цётка // Полымя. 1924. № 3; Арабей Л. Цётка. Мн., 1956; Еж. Стану песняй. Мн., 1977; Бярозкін Р. Постаці. Мн., 1971. *Л.Л.Арабей.*

Цётка.

ЦЁТЧА, адна з назваў *Павульскага возера* (Ушацкі р-н Віцебскай вобл.).

ЦЁЦЯ, у язычніцкай міфалогіі ўсх. славян багіня дабрабыту і ўрадлівасці. У каляндарным цыкле беларусаў яе ўладаранне прыпадала на перыяд жніва і да канца збору ўраджаю на палях, агародах і ў садах. Уяўлялі Ц. прыгожай, мажнай жанчынаю з жытнім вянком на галаве, у руках яна трымала бохан хлеба, садавіну, агародніну, якімі адорвала кожнага стрэчнага. Была сімвалам дабраты і шчодрасці. Галоднай зімою ці вясною селянін гаварыў: «Голад не Цёця, падапрэ — лыка з'ясі». Верагодна, гэты выраз ператварыўся ў прымаўку «голад — не цётка». *І.П.Хаўратовіч.*

ЦЗААФА́НІ (кіт., літар. — бунтары), удзельнікі атрадаў прац. моладзі, якія ствараліся мааісцкім кіраўніцтвам Кітая ў 1966—67 у час *«культурнай рэвалюцыі»*. Выконвалі тыя ж функцыі, што і *хунвэйбіны*: запалохванне, цкаванне і тэрарызаванне праціўнікаў палітыкі *Мао Цзэдуна*. Распушчаны ў канцы 1960-х г.

ЦЗІЛІ́НЬ, другая назва г. *Гірын* у Кітаі.

ЦЗІЛУ́Н, Кілун, горад у Кітаі, на Пн в-ва Тайвань, прав. Тайвань. Каля 356 тыс. ж. (1992). Аванпорт г. *Тайбэй*, з якім утварае адзіны прамысл. комплекс. Гандл.-прамысл. цэнтр. Прам-сць: маш.-буд. (у т.л. суднабудаванне), хім., цэментавая, харчовая. Марскія промыслы. Чыг. паромная пераправа ў Іасу (Паўд. Карэя).

ЦЗІНА́НЬ, горад на У Кітая, на р. Хуанхэ. Адм. ц. правінцыі Шаньдун. 1,5 млн. ж. (1990). Вузел чыг. і шашэйных дарог. Буйны цэнтр вытв-сці гумавых вырабаў. Прам-сць: машынабудаванне (станкі, прамысл. абсталяванне, аўтамабілі і інш.), металургічная, хім., нафтахім., харч., папяровая, тэкстыльная, у т.л. дывановая вытв-сць. Ун-т. ВНУ.

ЦЗІНДЭ́ЧЖЭ́НЬ, Фулян, горад на У Кітая, на р. Чанцзян (бас. воз. Паянху), правінцыя Цзянсі. 329 тыс. ж. (1990). З канца 6 ст. Ц. («сталіца фарфору») — адзін з найважн. цэнтраў кіт. фарфаравай вытв-сці.

ЦЗІНЬ, кітайская імператарская дынастыя [265—420]. Адрозніваюць Зах. Ц. [265—316] і Усх. Ц. [317—420]. Першая засн. палкаводцам Сыма Янем, які ў 280 перамог царства У і на кароткі час аб'яднаў дзяржаву; сталіца — г. Лаян. Міжусобіцы канца 3 — пач. 4 ст. аслабілі імперыю і дазволілі хуну і інш. качавым плямёнам захапіць Паўн. Кітай; у 316 імператар Мінь-дзі ўзяты імі ў палон. Адзін з саноўнікаў імперыі Сыма Жуй у 317 засн. Усх. Ц.; сталіца — г. Цзянькан (цяпер г. *Нанкін*). У час праўлення Усх. Ц. вялася бесперапынная барацьба за ўладу паміж знаццю Паўн. і Паўд. Кітая. У 420 да ўлады прыйшла дынастыя Сун (гл. *Паўднёвыя і паўночныя дынастыі* ў Кітаі).

ЦЗІНЬ, дзяржава і дынастыя *чжурчжэняў* [1115—1234]. Узнікла ў працэсе барацьбы чжурчжэняў супраць *кіданяў*, якім яны плацілі даніну. У 1125 Ц. захапіла кіданьскую дзяржаву Ляо, у 1125—27 — значную ч. імперыі Паўн. Сун, у т.л. яе сталіцу Кайфын. У выніку мірнага дагавора 1139 дзяржава Паўд. Сун прызнала васальную залежнасць ад Ц. З сярэдзіны 12 ст. Ц. — магутная дзяржава Усх. Азіі, у склад якой увахо-дзілі тэр. сучасных Паўн.-Усх. і Паўн. Кітая, частка Унутр. Манголіі; у васальнай залежнасці ад Ц. былі тангуцкая дзяржава *Сі-Ся* і Карэя. У 1234 Ц. знішчана ў выніку *мангольскіх заваяванняў*.

ЦЗІНЬЧЖО́Ў, Цзіньсянь, горад на ПнУ Кітая, паблізу вусця р. Сяалінхэ, прав. Ляанін. 625 тыс. ж. (1990). Трансп. вузел. Прам-сць: хім. (нафтахім. з-ды), фарфаравая, металаапр., тэкст., папяровая, харчовая.

ЦЗІСІ́, горад на ПнУ Кітая, у верхнім цячэнні р. Мулінхэ, прав. Хэйлунцзян. 683 тыс. ж. (1990). Цэнтр вуглездабычы. Прам-сць: маш.-буд., буд., дрэваапр., харчовая.

ЦЗЫБО́, Чжандзянь, горад на Пн Кітая, у прав. Шаньдун. 1,1 млн. ж. (1990). Прам-сць: горназдабыўная (вугаль, баксіты, вогнетрывалыя матэрыялы), металургічная, маш.-буд., хім., лёгкая, харчовая.

ЦЗЮЛУ́Н, Каулун, горад на тэр. Сянгана (Ганконг), на Пд п-ва Цзюлун. Адміністрацыйна складае частку (гар. р-н) г. *Сянган*. Порт на Паўд.-Кітайскім моры. Прам-сць: суднабудаванне, харч., лёгкая.

ЦЗЯАЧЖАЎВА́НЬ, бухта Жоўтага м. каля паўд. берага Шаньдунскага п-ва, у Кітаі. Шыр. ўвахода каля 6 км, у сярэдняй ч. 24 км, глыб. да 12 м. У суровыя зімы замярзае. Каля ўвахода ў бухту — горад і порт Цындао.

ЦЗЯЛІНЦЗЯ́Н, рака ў Кітаі, левы прыток р. Янцзы. Даўж. 1119 км, пл. бас. 160 тыс. км^2. Пачынаецца на паўд. схілах хр. Цыньлін, перасякае Сычуаньскую катлавіну. Асн. прытокі: Байлунцзян, Фаўцзян (справа), Цюйцзян (злева). Летняя паводка. Сярэдні расход вады каля 2100 м^3/с. Выкарыстоўваецца для арашэння. Суднаходная ад г. Наньчун. У вусці — г. Чунцын.

ЦЗЯМУСЫ́, горад на ПнУ Кітая, прав. Хэйлунцзян. 493 тыс. ж. (1990). Трансп. вузел. Порт на р. Сунгары. Прам-сць: цэлюлозна-папяровая, харч., вытв-сць прамысл. абсталявання, с.-г. машын.

ЦЗЯНСІ́, правінцыя на У Кітая. Пл. 166,6 тыс. км^2. Нас. 41,86 млн. ж. (2001). Адм. ц. — г. *Наньчан*. Унутр. ч. займае нізінная раўніна ў бас. воз. Паянху, па ўскраінах — горныя хрыбты (Уішань, Цзюліншань, Муфушань). Клімат субтрапічны, мусонны. Сярэдняя т-ра студз. 4—10 °С, ліп. 27—30 °С, ападкаў 1400—1700 мм за год. Гал. рэкі — Янцзы і Ганьцзян. Асн. галіна сельскай гаспадаркі — земляробства. Гал. культура — паліўны рыс (па 2 ураджаі за год). Вырошчваюць таксама пшаніцу, ячмень, батат, бабовыя, чай, цытрусавыя і тэхн. культуры (бавоўнік, джут, рамі, тытунь, цукр. трыснёг, алейныя). Гадуюць свіней, буйн. раг. жывёлу, у т.л. буйвалаў. Птушкагадоўля. Рыбалоўства. Здабыча вальфраму, свінцу, волава, цынку, медзі, малібдэну, марганцу, золата, урану, кам. вугалю. Прам-сць: машынабудаванне (аўтамабілі, трактары, станкі), тэкст., шкляная, фарфаравая (найб. ў Кітаі ф-ка ў г. Цзіндэчжэнь), папяровая, хім., харчовая. Найб. гарады: Наньчан, Цзіндэчжэнь, Цзюцзян, Ганьчжоў. Суднаходства па воз. Паянху, рэках Янцзы і Ганьцзян.

ЦЗЯНСУ́, правінцыя на У Кітая, па ніжнім цячэнні р. Янцзы. Абмываецца Жоўтым і Усх.-Кітайскім морамі. Пл. 102,6 тыс. км^2. Нас. 73,55 млн. ж. (2001); адзін з найб. шчыльна заселеных раёнаў Кітая. Адм. ц. — г. *Нанкін*. Размешчана ў паўд.-ўсх. ч. Вял. Кітайскай раўніны. Клімат субтрапічны, мусонны. Сярэдняя т-ра студз. ад -0,6 °С на Пн да 4 °С на Пд, ліп. 26—29 °С. Ападкаў 600—1200 мм за год. Гал. рака — Янцзы. Воз. Хунцзэху. Ц. — эканамічна развіты індустр.-агр. раён Кітая. Здабыча кам. вугалю, жал. руды, апатытаў, кааліну, солі. Прам-сць: машынабудаванне (судны, лакаматывы, трактары, станкі, горнае абсталяванне, электратэхніка, электроніка), металургія, лёгкая, хім., цэм., шкляная, керамічная,

харчовая. Саматужныя промыслы і маст. рамёствы. Шматгаліновая сельская гаспадарка з перавагай земляробства. Буйныя арашальныя сістэмы. Вырошчваюць рыс, пшаніцу, ячмень, боб, кукурузу, батат. Ц. — адзін з гал. раёнаў баваўнаводства і шаўкаводства. Развіта свіна- і птушкагадоўля. Рыбалоўства і марскі промысел. Суднаходства па р. Янцзы (даступная для марскіх суднаў на ўсёй тэр. Ц.), *Вялікім канале*. Гал. прамысл. і партовыя гарады: Нанкін, Усі, Сучжоў, Чанчжоў, Наньтун, Ляньюньган.

ЦЗЯН ЦЗЭМІ́НЬ (н. 17.8.1926, г. Янчжоў, Кітай), дзяржаўны і паліт. дзеяч Кітая. Скончыў Шанхайскі політэхн. ін-т «Цзяатун» (1947). Працаваў на інж. і кіруючых пасадах на з-дах і ў тэхнал.-даследчых ін-тах, з 1973 у апараце 1-га Мін-ва машынабудавання. Стажыраваўся ў СССР (1955—56), узначальваў групы кіт. спецыялістаў у Румыніі (1971—73; з кіт. дапамогай там пабудаваны 10 з-даў) і Пакістане (1976). З 1980 нам. старшыні і адказны сакратар Дзярж. к-таў КНР па кіраванні экспартам, імпартам і замежнымі інвестыцыямі. З 1982 нам. міністра, міністр электроннай прам-сці. Мэр г. Шанхай (1985—88), сакратар яго гаркома КПК (1987—89), Чл. ЦК (1982—2002) і Палітбюро ЦК (1987—2002) КПК. Ген. сакратар (чэрв. 1989 — ліст. 2002), старшыня Ваен. савета (з ліст. 1989) ЦК КПК і старшыня КНР (сак. 1993 — сак. 2003). Праводзіў курс на паглыбленне рыначных рэформ пры захаванні кіруючай ролі КПК. У 2001 наведаў з афіц. візітам Беларусь.

Тв.: Рус. пер. — Реформа, развитие, стабильность: Статьи и выступления. 2 изд. М., 2001; У кн.: Творцы истории: Мао Цзэдун, Дэн Сяопин, Цзян Цзэминь: Статьи и выступления. Мн., 2001.

ЦІБО́ (Thibaud) Жак (27.9.1880, г. Бардо, Францыя — 1.9.1953), французскі скрыпач, педагог. Скончыў Парыжскую кансерваторыю (1896). Сольную дзейнасць пачаў у 1898 у Парыжы. Гастраліраваў у многіх краінах свету як саліст і ансамбліст, у т.л. ў трыо з А.Карто і П.*Касальсам*. Яго выкананне вызначалася вытанчанасцю, віртуознасцю, пявучасцю. Выкладаў у «Эколь нармаль» у Парыжы. У 1943 з М.*Лонг* арганізаваў конкурс піяністаў і скрыпачоў (з 1946 Міжнар. імя Лонг — Ц.). Напісаў аўтабіягр. кн. «Гаворыць мая скрыпка» (1946).

Літ.: Ойстрах Д. Жак Тибо // Сов. музыка. 1953. № 11.

ЦІ́ВЕРЦЫ, група ўсх.-слав. плямён, якія ў канцы 1-га тыс. н.э. насялялі тэр. паміж Днястром, Прутам і Дунаем. Упамінаюцца ў «Аповесці мінулых часоў». З 1-й пал. 10 ст. ў складзе Кіеўскай Русі, у 944 удзельнічалі ў паходзе Ігара на Візантыю. Займаліся земляробствам, у 10—11 ст. у Ц. развіваліся феад. адносіны. У 12—13 ст. землі Ц. належалі *Галіцка-Валынскаму княству*. Пазней нашчадкі Ц. увайшлі ў склад насельніцтва Малдавіі.

ЦІВО́ Пётр Піліпавіч (н. 1.9.1941, в. Чарняўка Крупскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне аграхіміі і аграэкалогіі. Д-р с.-г. н. (1996). Скончыў БСГА (1970). З 1970 у Бел. НДІ меліярацыі і лугаводства. Навук. працы па пытаннях павышэння эфектыўнасці хімізацыі меліяратыўнага земляробства, распрацоўцы экалагічна бяспечных тэхналогій выкарыстання азотных і вадкіх арган. угнаенняў.

Тв.: Эффективное использование бесподстилочного навоза. Мн., 1988 (разам з С.Г.Дробатам); Нитраты: слухи и реальность. Мн., 1990 (разам з Л.А.Саскевіч); Тяжелые металлы и экология. Мн., 1996 (разам з І.Г.Быцко); Радыяцыя, нітраты і чалавек. 2 выд. Мн., 1998 (у сааўт.).

Цзян Цзэмінь.

Я.К.Цікоцкі.

ЦІВУ́Н, 1) службовая асоба дваровай адміністрацыі ў Кіеўскай Русі, якая кіравала гасп. справамі і ажыццяўляла суд па цывільных справах. З «Рускай праўды» вядомы Ц. вогнішчавы, канюшы, сельскі, ратайны. 2) У ВКЛ кіраўнік феад. двара-маёнтка. У 15 ст. Ц. прызначаў вял. князь для кіраўніцтва велікакняжацкімі дварамі з валасцямі, якія не былі судова-адм. адзінкамі. У іх кампетэнцыю ўваходзіла вядзенне дваровай гаспадаркі, збор даніны і інш. павіннасцей з валаснога насельніцтва, а таксама суд над ім (мясц. шляхта не падлягала юрысдыкцыі Ц.). З пач. 16 ст. такія Ц. пачалі звацца *дзяржаўцамі*. Старая назва захавалася толькі за Ц. віленскім, троцкім і жамойцкім. 3) У ВКЛ Ц. (гуменнікі) — катэгорыя сялян-слуг (гл. *Слугі*), якія загадвалі вядзеннем панскай дваровай гаспадаркі. Яны адказвалі за зберажэнне і расход збожжа, гадоўлю пры двары жывёлы і інш. Як прадстаўнік уласнага маёнтка Ц. прысутнічаў на судзе трымальніка ўладання, судзіў простых людзей, сачыў за працай сялян у маёнтку і інш. Ц. з сялян, чэлядзі дваровай, часам са шляхты прызначаў уласнік маёнтка (ці яго прадстаўнік). За выкананне абавязкаў Ц. даваўся вольны ад павіннасцей надзел зямлі або яго надзел вызваляўся ад інш. павіннасцей. Акрамя гэтага, у 17—18 ст. Ц. атрымліваў грашовае і натуральнае ўтрыманне або толькі натуральнае ўтрыманне. *А.Б.Доўнар.*

ЦІВУ́НШЧЫНА, падатак у ВКЛ у 15 — сярэдзіне 16 ст. Першапачаткова — збор у валасцях на карысць велікакняжацкіх *цівуноў* як плата за выкананне імі адм. функцый. З сярэдзіны 15 ст. збіралася ў велікакняжацкі скарб, аднак вял. князі ВКЛ маглі аддаваць збор Ц. ў валасцях сваім баярам за службу. Мела фіксаваны памер, часцей збіралася грашыма, радзей мёдам. Пры вял. кн. Казіміру (1440—92) Ц. з г. Магілёў і воласці складала 80 коп грошаў. У ходзе правядзення валочнай памеры і інш. рэформ Жыгімонта II Аўгуста Ц. заменена на інш. падаткі.

В.С.Пазднякоў.

ЦІК (франц. tic), хуткія міжвольныя паўтаральныя скарачэнні шкілетнай мышцы або групы мышцаў. Бывае псіхагенны (функцыян., звязаны з псіхатраўміравальнымі сітуацыямі) і арган. (захворванні або пашкоджанні галаўнога мозга ў выніку запалення, інтаксікацыі, траўмы, ужывання лекаў і інш.), лакалізаваны (у пэўнай вобласці цела) і генералізаваны (ахоплівае групы мышцаў ва ўсіх ч. цела). Найб. часта назіраецца ў вобласці галавы (паторгванне і нахмурванне броваў, марганне, зажмурванне вачэй і інш.), радзей — рук, ног і інш. Часта ўзнікае на фоне павышанай узбудлівасці нерв. сістэмы. Лячэнне тэрапеўт., зрэдку — нейрахірургічнае.

І.М.Семяненя.

ЦІК (Tieck) Людвіг Іаган (31.5.1773, Берлін — 28.4.1853), нямецкі пісьменнік; прадстаўнік *іенскіх рамантыкаў*. Вучыўся ва ун-тах Галле, Эрлангена, Гётынгена (1792—95). У сентыменталісцкім рамане «Гісторыя спадара Уільяма Ловеля» (1795—96) і інш. адчувальныя ўплывы л-ры «Буры і націску», англ. гатычнага рамана. Рамант. перыяд яго творчасці прадстаўлены «Народнымі казкамі, выдадзенымі Петэрам Лебрэхтам» (т. 1—3, 1797), у якіх выступіў як знаўца чалавечай душы, майстар рамант. іроніі. У цэнтры «рамана выхавання» «Вандраванні Франца Штэрнбальда» (1798) праблемы самавызначэння мастака, стасункаў мастацтва і грамадства. У камедыях-казках «Кот у ботах», «Сіняя барада» (абедзве 1797), «Свет навыварат» (1799) і інш. вострая сатыра на феад. парадкі, на рамантызм з яго прэтэнзіяй на пераадоленне высокай паэзіяй грубай прозы жыцця. Аўтар зб. «Рамантычныя паэмы» (т. 1—2, 1799—1800), гіст. аповесцей «Мяцеж у Севенах» (1826) і «Малады сталяр» (1836), рамана «Віторыя Акарамбона» (1840) і інш.

Тв.: Рус. пер. — Странствия Франца Штернбальда. М., 1987.

Літ.: Берковский Н.Я. Романтизм в Германии. СПб., 2001. *Г.В.Сініла.*

ЦІКАВЕ́НКА Анатоль Герасімавіч (н. 6.6.1952, в. Новая Алешня Рагачоўскага

р-на Гомельскай вобл.), бел. юрыст. Д-р юрыд. н. (1993), праф. (1995). Засл. юрыст Беларусі (2002). Скончыў БДУ (1977). З 1981 пам. прэзідэнта АН Беларусі. У 1986—89 і з 1992 у Ін-це філасофіі і права АН Беларусі. З 1995 заг. лабараторыі Н.-д. цэнтра праблем дзярж. кадравай палітыкі і ўдасканальвання дзярж. кіравання Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. З 1997 суддзя Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь, адначасова праф. у БДУ. Навук. працы па гісторыі дзяржавы і тэорыі права.

Тв.: Начальник и подчиненный: Правовые аспекты служебных отношений. Мн., 1984; Кадровая политика в условиях перестройки. Мн., 1990; Авторитет власти: прошлое и настоящее. Мн., 1992.

ЦІКА́ВЫ Вадзім Фёдаравіч (9.10.1930, в. Цялуша Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл. — 27.12.2002), бел. хімік і педагог. Канд. хім. н. (1961), праф. (1989). Засл. работнік вышэйшай школы Беларусі (1982). Скончыў БДУ (1955), дзе і працаваў да 2002 (у 1978—95 дэкан ф-та). Навук. працы па вывучэнні неарган. палімерных сістэм на аснове солей многавалентных металаў і многаасноўных к-т. Аўтар навучальных дапаможнікаў для школ і ВНУ.

Тв.: Полимерное строение неорганических соединений. Мн., 1985; Пособие по химии для поступающих в вузы. 2 изд. Мн., 1986 (разам з Ф.М.Капуцкім); Общая химия в формулах, определениях, схемах. Мн., 1996 (у сааўт.). *П.М.Бараноўскі.*

ЦІКО́ЦКІ Міхаіл Яўгенавіч (н. 20.2.1922, г. Бабруйск Магілёўскай вобл.), бел. мовазнавец, журналіст. Сын Я.К.*Цікоцкага*. Д-р філал. н. (1972), праф. (1973). Скончыў БДУ (1950). З 1950 працаваў у друку, у 1953—89 у БДУ (з 1965 заг. кафедры). Даследуе пытанні стылістыкі бел. мовы і стылістыкі газетных жанраў: «Некаторыя выпадкі стылістычнага выкарыстання сінтаксічных сродкаў беларускай мовы» (1958), «Практычная стылістыка беларускай мовы» (ч. 1—2, 1962—65), «Стылістыка публіцыстычных жанраў» (1971), «Сугучнасць слоў жывых...: Нататкі па стылістыцы мастацкай літаратуры» (1981). Аўтар кн. па тэорыі і практыцы журналістыкі «З гісторыі беларускай журналістыкі XIX ст.» (1960) і інш.

Тв.: Стылістыка беларускай мовы. 2 выд. Мн., 1995; Стылістыка тэксту. Мн., 2002.

ЦІКО́ЦКІ Яўген Карлавіч (26.12.1893, С.-Пецярбург — 23.11.1970), бел. кампазітар, адзін з заснавальнікаў бел. прафесійнай музыкі. Нар. арт. Беларусі (1953). Нар. арт. СССР (1955). Вучыўся ў Пецярбургу ў псіханеўралагічным ін-це (1911—14), ун-це (1914—15), адначасова ў прыватным муз. вучылішчы З.Бонч-Бруевіч. З 1920 жыў у Бабруйску; адзін з арганізатараў (1927) і выкладчык муз. школы. З 1934 у Мінску. У разнажанравай яго творчасці пераважала гіст.-рэв. тэматыка, гераічныя вобразы. Вытокі яго муз. мовы ў бел. фальклоры і масавай песні. У муз. драматургіі оперных, сімф., вак.-інстр. твораў развітая лейтматыўная сістэма. Сярод твораў: оперы «Міхась Падгорны» (паст. 1939; 2-я рэд. 1957), «Алеся» (паст. 1944; новая рэд. «Дзяўчына з Палесся», паст. 1957; канчатковая рэд. «Алеся», паст. 1967) і інш.; араторыі «Вызваленне» (1939) і «У.І.Ленін» (1946, абедзве не скончаны); гераічная паэма для баса, хору і сімф. аркестра «Песня пра Буравеснік» (1920; 3-я рэд. 1944); 6 сімфоній (1927, 1941, 1948, 1955, 1958, 1963); сімф. паэма «50 гадоў» (1966); уверцюра «Свята на Палессі» (1953); канцэрты для трамбона (1934) і фп. (1954) з аркестрам; хары; песні; музыка да спектакляў і фільмаў. Старшыня праўлення Саюза кампазітараў Беларусі (1950—63). Дзярж. прэмія Беларусі 1968.

Літ.: Гусин И.Л. Е.К.Тикоцкий. М.; Л., 1965; Нісневіч С.Г. Яўген Цікоцкі. Мн., 1972; Дубкова Т.А. Сімфоніі Я.Цікоцкага // Дубкова Т.А. Беларуская сімфонія. Мн., 1974. *Т.А.Дубкова.*

ЦІ́ЛЫ (ад грэч. tylos уздуцце, патаўшчэнне), вырасты клетак восевай ці прамянёвай *парэнхімы* раслін. Запаўняюць поласці сасудаў і трахеід у ядровай драўніне або ў пашкоджаных участках *ксілемы*. Характэрны пераважна для дрэвавых раслін. Спыняюць транспарт рэчываў па сасудах, з'яўляюцца мех. перашкодай на шляху ґіфаў грыба, якія пранікаюць па сасудах. Рэчывы, што назапашваюцца ў Ц. (смолы, камедзі, таніны), маюць антысептычныя ўласцівасці і павышаюць трываласць драўніны да загнівання.

ЦІЛЬВІ́ЦІС (Tilvytis) Тэафіліс (28.1.1904, в. Гайджай, Літва — 5.5.1969), літоўскі паэт. Нар. паэт Літвы (1954). Друкаваўся з 1923. У лірыка-сатыр. паэме «Аратыя» (ч. 1—4, 1930—65) гіст. хроніка Літвы; яна адзначана фрагментарнасцю кампазіцыі, умоўнымі сімвалічнымі вобразамі, эпіграмнасцю. Эпічная паэма «Дзічус» (1934) і раман «Падарожжа вакол стала» (1936) — сатыра на «залатую моладзь», бюракратаў. Аўтар зб-каў лірыкі «Вецер Балтыкі» (1948), «Санеты пра шчасце» (1951), «Дом мой родны» (1958), паэм «Уснынэ» (1949, у рус. пер. «На зямлі літоўскай», 1953), «Песня цаною жыцця» (1962, пра В.*Монтвілу*) і інш. На бел. мову асобныя яго вершы пераклалі А.Астрэйка, С.Быстрыцкая, Я.Семяжон, М.Танк. Дзярж. прэмія СССР 1951.

Тв.: Raštai. T. 1—6. Vilnius, 1975—82; Бел. пер. — у кн.: Літоўская савецкая паэзія: Анталогія. Мн., 1977. Т. 1; Рус. пер. — Избранное. М., 1951; Поэмы. М., 1958; Стихи. М., 1964.

Літ.: Кубилюс В. Теофилис Тильвитис. М., 1958.

ЦІ́МАНАВА, вёска ў Клімавіцкім р-не Магілёўскай вобл., на р. Перавалочня. Цэнтр сельсавета і рэсп. унітарнага с.-г. прадпрыемства. За 6 км на ПдЗ ад горада і 4 км ад чыг. ст. Клімавічы, 130 км ад Магілёва. 1794 ж., 701 двор (2003). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, 2 аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЦІМА́НА-ПЯЧО́РСКАЯ НАФТАГАЗАНО́СНАЯ ПРАВІ́НЦЫЯ. У Расійскай Федэрацыі на тэр. Рэсп. Комі і Ненецкай аўт. акругі Архангельскай вобл. Абмежавана на ПдЗ Ціманскім кражам, на У — Уралам. Пл. 350 тыс. км^2. Адкрыта больш за 75 радовішчаў нафты і газу (больш за 230 пакладаў). Гал. радовішчы: нафтавыя — Ярэгскае, Усінскае, газакандэнсатнае — Вуктыльскае і інш. Саматужная здабыча нафты пачалася з 1745, разведачнае свідраванне вядзецца з 1890. Правінцыя прымеркавана да паўн.-ўсх. ч. Усх.-Еўрапейскай платформы, таксама да Перадуральскага і Перадпайхойскага краявых прагінаў. Прадукцыйныя адклады сілуру, дэвону, карбону, пярмі і трыясу. Нафты метананафтэнавыя, шчыльн. 807—981 кг/м^3.

ЦІМА́НА-ПЯЧО́РСКІ НАФТАГАЗАНО́СНЫ БАСЕ́ЙН, гл. ў арт. *Цімана-Пячорская нафтагазаносная правінцыя.*

ЦІМА́НСКІ КРАЖ, узвышша на ПнУ Усх.-Еўрапейскай раўніны, паміж Чэшскай губой і зах. адгор'ямі Урала, у Расіі. Даўж. каля 900 км, выш. да 471 м (Чэтласкі Камень). Далінамі рэк Піжмы Пячорскай і Піжмы Мязенскай падзяляецца на паўд. (у межах тайгі, моцна забалочана) і паўн. (у зоне тундры і лесатундры) часткі. Радовішчы нафты і газу (*Цімана-Пячорская нафтагазаносная правінцыя*).

ЦІМАФЕ́ЕВА Людміла Яфімаўна (н. 1.1.1934, г. Лесазаводск Прыморскага краю, Расія), бел. актрыса. Засл. арт. Беларусі (1967). Скончыла Бел. тэатр.-маст. ін-т (1955). Да 1990 працавала ў Бел. рэсп. т-ры юнага гледача. Выконвала пераважна ролі маладых гераінь: Тоня Туманава («Як гартавалася сталь» паводле М.Астроўскага), Аня Бярозка («Каханне Ані Бярозка» У.Пісталенкі), Ліза («Няроўны бой» В.Розава), Джэма («Авадзень» паводле Э.Войніч), Галінка («За лясамі дрымучымі» А.Вольскага і П.Макаля), Марыя—Вераніка («Зорка Венера» М.Алтухова і Б.Бур'яна), Насця («Несцерка» В.Вольскага). Сярод найб. значных работ: Яніна, Ядзя («Папараць-кветка» і «Над хвалямі Серабранкі» І.Козела), Эдзіт Піяф (аднайм. п'еса В.Легентава) і інш. *Дз.У.Стэльмах.*

ЦІМАФЕ́ЕВА Ніна Уладзіміраўна (н. 11.6.1935, С.-Пецярбург), расійская артыстка балета. Нар. арт. СССР (1969). Скончыла Ленінградскае харэагр. вучылішча (1953). З 1953 салістка Ленінградскага т-ра оперы і балета, з 1956 —

Вял. т-ра ў Маскве, у 1989—91 рэпетытар у ім. Адна з вядучых трагедыйных актрыс класічнага балетнага т-ра 1960—70-х г. Яе выканальніцтва вызначалася маштабнасцю рухаў, высокім, моцным скачком. Сярод партый: Адэта — Адылія («Лебядзінае возера» П.Чайкоўскага), Гаспадыня Меднай гары («Каменная кветка» С.Пракоф'ева), Мехменэ-Бану («Легенда пра каханне» А.Мелікава), лэдзі Макбет («Макбет» К.Малчанава) і інш. Здымалася ў тэлебалетах і кінафільмах-балетах («Спартак», 1976) і інш. З 1991 за мяжой.

ЦІМАФЕЕЎ Іван (?—1631), расійскі гісторык і дзярж. дзеяч. У пач. 17 ст. дзяк у шэрагу маскоўскіх прыказаў, з 1607 у Вял. Ноўгарадзе, Астрахані, Яраслаўлі, Ніжнім Ноўгарадзе. Аўтар «Летапісу», у якім ёсць карысныя звесткі па гісторыі Расіі 2-й пал. 16 — пач. 17 ст.: аб праўленнях Івана IV, Фёдара Іванавіча, Барыса Гадунова, Ілжэдзмітрыя I, Смуце, якую лічыў вынікам парушэння спрадвечнага сац. і паліт. ўладкавання грамадства.

Тв.: Временник. М., Л., 1951.

Літ.: Корецкий В.И. Новые материалы о дьяке Иване Тимофееве, историке и публицисте XVII в. // Археографический ежегодник за 1974 г. М., 1975.

ЦІМАФЕЕЎКА, жыцец (Phleum), род кветкавых раслін сям. метлюжковых (злакаў). Каля 20 відаў. Пашыраны ў нетрапічных абласцях абодвух паўшар'яў. На Беларусі 2 віды Ц.: лугавая (Ph.pratense) і стэпавая (Ph.phleoides). Пашыраны на лугах, лясных палянах, уздоўж дарог. Як кармавую расліну вырошчваюць Ц. лугавую (культывуецца ў Еўропе з 18 ст.), адзін з асн. кампанентаў сенажатных і пашавых травасумесей. Выведзена больш за 50 сартоў.

Ц. лугавая — шматгадовы рыхлакустовы верхавы злак. Карэнішча кароткае. Сцёблы прамыя, выш. да 1 м. Лісце шматлікае, вузкалінейнае, шурпатае. Суквецце — шчыльная цыліндрычная мяцёлка, каласкі дробныя. Плод — зярняўка.

В.М.Прохараў.



Цімафееўка лугавая.

ЦІМАШПО́ЛЬСКІ Уладзімір Ісакавіч (н. 14.7.1954, г. Днепрадзяржынск, Украіна), бел. вучоны ў галіне металургіі; заснавальнік бел. навук. школы па металург. цеплатэхналогіях. Д-р тэхн. н. (1991), праф. (1992). Скончыў Днепрадзяржынскі індустр. ін-т (1976). У 1983—94 і з 1996 у Бел. нац. тэхн. ун-це (з 2000 заг. кафедры). У 1984—94 і з 1999 кіраўнік і ўдзельнік асваення праектных магутнасцей агрэгатаў *Беларускага металургічнага завода*. З 2003 дырэктар Ін-та цепла- і масаабмену Нац. АН Беларусі. Навук. працы па цеплафізіцы, цеплаэнергетыцы і тэхналогіі металург. працэсаў. Распрацаваў тэарэт. асновы рэсурса- і энергазберагальных прамысл. высокатэмпературных цеплатэхналогій у металургіі і машынабудаванні. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1988. Дзярж. прэмія Беларусі 1998.

Тв.: Теплотехнологические основы металлургических процессов и агрегатов высшего технического уровня. Мн., 1995; Промышленные теплотехнологии. Ч. 1—5. Мн., 1995—2000 (у сааўт.); Стальной слиток. Т. 1—3. Мн., 2000—01 (у сааўт.).

А.І.Болсун.

ЦІМАШЭ́НКА Аляксандр Вікенцьевіч (н. 5.12.1958, в. Побалава Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.), бел. вучоны ў галіне біяфізікі. Д-р біял. н. (1998). Скончыў БДУ (1980), дзе і працаваў. З 1999 у Ін-це фотабіялогіі Нац. АН Беларусі. З 2001 у Канадзе. Навук. працы па вывучэнні біял. ролі монааксіду азоту, лекцінаў расл. і жывёльнага паходжання, працэсаў трансмембраннай перадачы сігналаў у нармальных і пухлінных клетках, малекулярных механізмаў міжклетачных узаемадзеянняў. Дзярж. прэмія Беларусі 2000.

Тв.: Применение эндогенных лектинов в клинической диагностике // Мед. новости. 1997. № 4; Биофизика живых систем: от молекулы к организму. Мн., 2002 (у сааўт.).

А.Б.Самаль.

ЦІМАШЭ́НКА Іван Архіпавіч (н. 18.11.1924, в. Навінкі Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.), поўны кавалер ордэна Славы. Скончыў Кіеўскае танк. тэхн. вучылішча (1958). У Чырв. Арміі з 1942. У Вял. Айч. вайну з 1944 на 2-м і 3-м Укр. франтах. Механік-вадзіцель танка ст. сяржант Ц. вызначыўся ў баях на тэр. Зах. Еўропы: 23.9.1944 у баі за вышыню каля г. Турда (Румынія) экіпаж яго танка знішчыў 2 процітанк. гарматы і бронетранспарцёр праціўніка; у снеж. 1944 каля г. Шагі (Чэхаславакія) не дазволіў ворагу ўзарваць мост цераз р. Іпель да падыходу сав. войск; 30.3.1945 у баі за нас. пункт Шмейц (Аўстрыя) захапіў 2 гарматы, мінамёт, паранены не пакінуў поля бою. Да 1970 у Сав. Арміі.

У.І.Цімашпольскі. С.К.Цімашэнка. К.А.Ціміразеў.

ЦІМАШЭ́НКА Павел Андрэевіч (н. 1.1.1940, в. Побалава Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.), бел. вучоны-медык у галіне хвароб вуха, горла, носа. Д-р мед. н. (1991), праф. (1993). Скончыў Віцебскі мед. ін-т (1963). З 1970 у Бел. НДІ экспертызы працаздольнасці і арг-цыі працы інвалідаў. З 1975 у Бел. мед. акадэміі паслядыпломнай адукацыі. З 1989 у Бел. мед. ун-це (заг. кафедры), адначасова гал. отарыналарынголаг Мін-ва аховы здароўя Беларусі. Навук. працы па праблемах захворванняў вуха, горла, носа (дыягностыка, кансерватыўнае і хірург. лячэнне, экспертыза, прафілактыка, рэабілітацыя).

Тв.: Диагностика болезней уха, горла, носа // Клиническая диагностика: Справ. пособие для семейного врача. Мн., 1999; Болезни уха, горла и носа. Мн., 2002 (разам з В.Я.Гапановічам).

ЦІМАШЭ́НКА Сямён Канстанцінавіч (19.2.1895, с. Фурманаўка Кілійскага р-на Адэскай вобл., Украіна — 31.3.1970), дзяржаўны і ваен. дзеяч СССР. Маршал Сав. Саюза (1940). Двойчы Герой Сав. Саюза (1940, 1965). Скончыў вышэйшыя ваен.-акад. курсы (1922), курсы ўдасканалення вышэйшага камсаставу (1927), курсы камандзіраў-адзінаначальнікаў пры Ваен.-паліт. акадэміі (1930). У арміі з 1915, у Чырв. Арміі з 1918. Удзельнік 1-й сусв. вайны. У грамадз. вайну камандаваў узводам, эскадронам, палком, кав. брыгадай, дывізіяй. З 1925 — кав. корпусам. З 1933 нам. камандуючага войскамі БВА, з 1935 — Кіеўскай ваен. акругі. З 1937 камандуючы войскамі Паўн.-Каўказскай, Харкаўскай, Кіеўскай асобай ваен. акруг. У час паходу Чырв. Арміі ў Зах. Украіну (1939) камандаваў Укр. фронтам. У сав.-фін. вайну 1939—40 камандаваў

войскамі Паўн.-Зах. фронту, які са значнымі стратамі прарваў *«Манергейма лінію»*. У 1940—41 нарком абароны. У Вял. Айч. вайну ў Стаўцы Вярх. галоўнакамандавання, галоўнакамандуючы Зах. і Паўд.-Зах. стратэг. напрамкамі, камандуючы войскамі Зах., Паўд.-Зах., Сталінградскага, Паўн.-Зах. франтоў, прадстаўнік Стаўкі па каардынацыі дзеянняў войск шэрагу франтоў і Чарнаморскага флоту. Пасля вайны камандуючы войскамі Баранавіцкай (1945—46), Паўд.-Уральскай (1946—49) і Бел. (1946, 1949—60) ваен. акруг. З 1960 у Групе ген. інспектараў Мін-ва абароны СССР, у 1961—70 старшыня Сав. камітэта ветэранаў вайны. Чл. ЦК ВКП(б) у 1939—52, канд. у чл. ЦК КПСС з 1952. Чл. ЦК КПБ у 1930—37, 1949—61. Чл. Бюро ЦК КПБ у 1949—60. Чл. ЦВК БССР у 1927—37. Дэп. Вярх. Савета СССР з 1937. Чл. прэзідыума Вярх. Савета СССР у 1938—40. Дэп. Вярх. Савета БССР у 1951—63. Яго імем названы спартыўна-стралковы комплекс у Мінску, на будынку Мін-ва абароны Рэспублікі Беларусь мемар. дошка. Узнагароджаны ордэнам «Перамога».

ЦІМАШЭ́НКА Уладзімір Мікалаевіч (н. 17.9.1956, г. Горкі Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне заатэхніі. Д-р с.-г. н. (1999). Скончыў БСГА (1979). З 1986 у НДІ жывёлагадоўлі (з 1996 нам. дырэктара). Навук. працы па ўдасканаленні існуючых і распрацоўцы новых тэхналогій вытв-сці прадукцыі жывёлагадоўлі інтэнсіўнымі метадамі.

Тв.: Стимулирующее действие ультразвука на развитие морфологических и функциональных свойств вымени нетелей в период подготовки к лактации // Весці Акадэміі агр. навук Рэспублікі Беларусь. 1997. № 2; Выращивание коров, адаптированных к интенсивной технологии. Брест, 1997; Концептуальные основы реконструкции молочно-товарных ферм (разам з А.Ф.Трафімавым, А.А.Музыкам) // Зоотехническая наука Беларуси. Мн., 2002. Т. 37.

ЦІМІРА́ЗЕЎ Клімент Аркадзевіч (3.6.1843, С.-Пецярбург — 28.4.1920), расійскі вучоны ў галіне батанікі і фізіялогіі раслін; адзін з заснавальнікаў рас. навук. школы фізіёлагаў раслін; тэарэтык *дарвінізму*. Чл.-кар. Пецярб. АН (1890), Рас. АН (1917). Скончыў Пецярб. ун-т (1866). У 1870—92 у Пятроўскай земляробчай і лясной акадэміі (цяпер Маскоўская с.-г. акадэмія яго імя). Адначасова з 1877 праф. Маскоўскага ун-та. У 1911 з групай выкладчыкаў пакінуў яго ў знак пратэсту супраць парушэння універсітэцкай аўтаноміі. Навук. працы па метадах даследавання фізіялогіі раслін, біял. асновах аграноміі, тістОрыі навукі. Раскрыў заканамернасці фотасінтэзу як працэсу выкарыстання святла для ўтварэння арган. рэчываў раслін. Папулярызатар дасягненняў у галіне фізіялогіі раслін. Публіцыст («Жыццё расліны», 1878; «Навука і дэмакратыя», 1920).

Тв.: Избр. соч. Т. 1—2. М., 1957; Наука и демократия: Сб. ст. М., 1963.

Літ.: Чайлахян М.Х. К.А.Тимирязев — ученый, борец, мыслитель. М., 1960; Сенченкова Е.М. К.А.Тимирязев и учение о фотосинтезе. М., 1961.

ЦІМКАВІЦКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА. У Капыльскім р-не Мінскай вобл., за 500 м на Пд ад в. Цімкавічы. Створана ў 1975 на р. Мажа. Пл. 0,75 км^2, даўж. 5,7 км, найб. шыр. 300 м, найб. глыб. 4,2 м, аб'ём вады 1,16 млн. м^3. Правы бераг разараны, левы (у вярхоўі высокі, да плаціны паніжаецца і пераходзіць у спадзісты) пад лугам. Ваганні ўзроўню вады на працягу года 1,5 м. Выкарыстоўваецца для арашэння с.-г. угоддзяў, рыбагадоўлі.

ЦІ́МКАВІЦКАЯ АПЕРА́ЦЫЯ 1942, баі паміж партызанамі і ням. фашыстамі ў вёсцы і на чыг. ст. *Цімкавічы* Капыльскага р-на 16 ліп. ў Вял. Айч. вайну. У гарнізоне гітлераўцаў, што размяшчаўся ў вёсцы і на станцыі, былі сканцэнтраваны ўправы трох валасцей, склады з нарабаваным у насельніцтва харчаваннем для арміі. Увечары 16 ліп. партызаны брыгады імя Варашылава Мінскай вобл. (кіраўнік П.П.Капуста) знялі вартавых і раптоўна атакавалі праціўніка. У выніку партызаны разгромілі гарнізон, разбурылі і спалілі станцыю, знішчылі склады з харчаваннем, захапілі трафеі і дакументы і арганізавана адышлі. Баючыся паўторнага нападу, гітлераўцы да сак. 1943 не аднаўлялі гарнізон.

ЦІ́МКАВІЦКІ КАСЦЁЛ СВЯТО́ГА МІХАІ́ЛА. Існаваў у 17—20 ст. у в. *Цімкавічы* Капыльскага р-на Мінскай вобл. Пабудаваны ў 1647. Уяўляў сабой 3-нефавы храм з 5-граннай 2-яруснай алтарнай апсідай, накрыты 2-схільным дахам з вальмамі над апсідай. Гал. фасад умацаваны паўкруглымі лапаткамі, падзелены на 2 ярусы прычолкамі з прафіляваным карнізам; верхні ярус у выглядзе атыка з паўвальмавым дахам. Спачатку фасад завяршалі 3 невял. вежы. У 1817 адрамантаваны. У пач. 20 ст. размаляваны слупы, столь, бэлькі і інш. элементы інтэр'ера (маст. Ф.Бруздовіч). Дэкар.-арнаментальная размалёўка з расл. і геам. матывамі выканана

Цімкавіцкі касцёл святога Міхаіла. Фота 1920-х г.

ў традыцыях нар. мастацтва. На ўваходных дзвярах каваная накладка ў выглядзе галінкі дуба з лісцем і жалудамі. Пасля Вял. Айч. вайны касцёл выкарыстоўваўся як царква (згарэла ў 1985).

ЦІ́МКАВІЧЫ, вёска ў Капыльскім р-не Мінскай вобл., каля *Цімкавіцкага вадасховішча*, на скрыжаванні аўтадарог на Капыль, Нясвіж, Семежава. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 11 км на ПдЗ ад г. Капыль, 136 км ад Мінска, 3 км ад чыг. ст. Цімкавічы. 2009 ж., 910 двароў (2003). Унітарныя прадпрыемствы райаграпрамзабеспячэння, райпаліўвазбыт, аўтапарк № 21, з-д жалезабетонных вырабаў, лесагадавальнік, база мінер. угнаенняў. Сярэдняя школа імя К.*Чорнага*, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі. Брацкія магілы пагранічнікаў, сав. воінаў і партызан. Магіла ахвяр фашызму. Помнік у гонар 17-га Чырванасцяжнага Цімкавіцкага пагранатрада. Помнікі архітэктуры: капліца і брама-званіца (2-я пал. 19 ст.). Літ. музей імя К.Чорнага.

Вядомы з 1499 у складзе Капыльскага княства ВКЛ. Уладанне Алелькавічаў, з 1585 Хадкевічаў, у 17 ст. Сапегаў, Палубінскіх, з канца 17 ст. — у 18 ст. Радзівілаў. З 16 ст. мястэчка. Паводле інвентара 1622, існавалі мястэчка і маёнтак Ц. У 17 ст. цэнтр воласці Навагрудскага пав. У 1647 пабудаваны *Цімкавіцкі касцёл святога Міхаіла*. У 1670 — 51 дым, 4 вуліцы, млын, Ільінская царква, касцёл, некалькі корчмаў. З 1793 у Рас. імперыі, мястэчка, цэнтр воласці Слуцкага пав. У 1863 адкрыта земскае нар. вучылішча. У 1886 у мястэчку 728 ж., 138 двароў, вучылішча, 2 царквы, касцёл, 2 яўр. малітоўныя школы, 6 заезных дамоў, 35 крам, нядзельны кірмаш; у сядзібе Ц. — бровар і піваварня. У пач. 20 ст. 1681 ж., 323 двары, пошта; у маёнтку 63 ж. У 1909—14 у школе Ц. вучыўся, у 1920—22 працаваў К.*Чорны*. У 1917 — 2253 ж., 355 двароў, вышэйшае пач. вучылішча; у маёнтку 202 ж. З 20.8.1924 да 24.9.1926 і з 27.9.1938 цэнтр сельсавета Капыльскага р-на. З 1938 вёска. У Вял. Айч. вайну дзейнічала падп. група, партызаны правялі *Цімкавіцкую аперацыю 1942*; у 1942 гітлераўцы загубілі ў Ц. 1018 ж., у 1944 часткова спалілі вёску.

Г.М.Новікава, В.М.Удальцоў (гісторыя).

ЦІМО́ХАЎ Сяргей Аляксандравіч (н. 8.9.1960, в. Кротаў Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. мастак. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1984). З 1985 працаваў у Гомельскім і Віцебскім (г. Наваполацк) маст. камбінатах, з 1989 гал. мастак г. Полацк Віцебскай вобл., у 1992—99 заснавальнік, дырэктар галерэі «РЫСА» у Полацку. У творах імкнецца ўвасобіць першаасновы быцця беларусаў, іх язычніцкія традыцыі, фантасмагорыі і касмаганізм праз сімвалічнасць зместу і формы, суразмернасць фактурнасці, выяўленчасці і абстрагаванай умоўнасці, жывапіснасць і тонкія колеравыя спалучэнні: «Несці крыж», «Канцэрт даўняй музыкі» (абодва 1989), «Дрэва-стод» (1991), «Птушыны сон» (1992), «Стод-1» (1994), «Рытуальнае шэсце-3» (1997), «Рытуальнае шэсце-7» (1999), «Цень Вялеса», «Ярыла» (абодва

2000), «Два месяцы», «Птушыны гоман» (абодва 2001). Аўтар дыпціхаў «Зіхценне Купальскай ночы», «Золак Купальскай ночы» (абодва 2002), графічных серый «Постаці», «Нацюрморт», «Краявід», лістоў «Назіраючы зацьменне Сонца-1», «Назіраючы зацьменне Сонца-2» (абодва 1999), манум. размалёвак.

ЦІМО́ШКАВІЧЫ, геалагічнае агаленне стараж. адкладаў; помнік прыроды рэсп. значэння (з 1963). Размешчаны ў рове на левабярэжжы р. Нёўда, паміж вёскамі Баранавічы (б.в. Цімошкавічы), Лукашын і Волца Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл. Адклады *муравінскага міжледавікоўя* ў выглядзе лінзы (магутнасць 8 м, даўж. 300 м), складзенай з торфу, азёрных супескаў і мергелю, багатыя рэшткамі выкапнёвых раслін, малюскаў, насякомых, дробных млекакормячых і земнаводных. Даследуюцца з 1903. Выяўлена каля 120 відаў раслін, 74 віды жывёл, у т.л. 63 прадстаўнікі энтамафауны, што адлюстроўваюць зах.-бел. тып лясных ландшафтаў і дробных відаў жывёл, якія існавалі каля 150—100 тыс. г. назад. *В.Ф.Вінакураў.*

ЦІМО́ШЫШЧЫ, Чумакі, возера ў Калінкавіцкім р-не Гомельскай вобл., у бас. р. Прыпяць, за 14 км на ПдУ ад г. Калінкавічы, за 2 км на ПдУ ад в. Пеніца. Пл. 0,2 км^2, даўж. 1,37 км, найб. шыр. 300 м, даўж. берагавой лініі 2,8 км. Катлавіна стужкападобнай формы, выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Схілы катлавіны невыразныя. Злучана пратокай з воз. Дворышча.

ЦІМУ́Р, Тамерлан, Цімур-ленг («Цімур кульгавы»; 1336, с. Хаджа-Ільгар каля г. Шахрысабз, Узбекістан — 18.2.1405), сярэдneазіяцкі дзярж. дзеяч, эмір, палкаводзец; заснавальнік дынастыі *Цімурыдаў*. Сын бека Тарагая з цюркізаванага манг. племені барлас. У 1370 захапіў уладу ў *Маверанахры*, дзе стаў кіраваць ад імя нашчадкаў *Чынгіс-хана*. Сталіца яго дзяржавы — г. Самарканд. З 1370-х г. здзейсніў больш за 20 паходаў. У 1380—90-я г. спалучаў аб'яднанне зямель Сярэдняй Азіі (да 1388 канчаткова падпарадкаваў Харэзм) з паходамі ў Іран, Закаўказзе і інш. У выніку трох паходаў супраць *Тахтамыша* (1389, 1391, 1394—95), разграміў *Залатую Арду*, абрабаваў яе сталіцу *Сарай-Берке* і інш. гарады. У 1398 уварваўся ў Індыю і захапіў г. Дэлі. Выйграў вайну з тур. султанам *Баязідам I*, якога ў час *Анкарскай бітвы 1402* узяў у палон. Распачаты ім у 1404 паход на Кітай перапынены з-за смерці Ц. У пач. 14 ст. яго дзяржава ўключала Маверанахр, Харэзм, Харасан, Закаўказзе, Іран і Пенджаб. Усе паходы Ц. суправаджаліся разбурэннем гарадоў, масавым знішчэннем і паланеннем насельніцтва.

Літ.: Новосельцев А.П. Об исторической оценке Тимура // Вопр. истории. 1973. № 2.

С.Цімохаў. Несці крыж. 1989.

ЦІМУРЫ́ДЫ, дынастыя, якая правіла ў Маверанахры, Харэзме, Харасане і інш. тэрыторыях у 1370—1507. Засн. *Цімурам*, які сам падзяліў дзяржаву паміж сынамі і ўнукамі. Пасля смерці Цімура Ц. абвясцілі сябе незалежнымі ўладарамі і пачалі міжусобную барацьбу за вярх. ўладу. У пач. 15 ст. ўтварыліся 2 дзяржавы: малодшага сына Цімура — Шахруха [1409—1447] з цэнтрам у Гераце (Харасан) і яго сына *Улугбека* з цэнтрам у Самаркандзе. У 1447 Улугбек атрымаў у спадчыну праўленне ўсёй краінай. Пасля яго смерці дынастычная барацьба аднавілася. Праўленне Султан-Хусейна [1469—1506] — перыяд росквіту культуры ў Гераце. Пры яго сынах у пач. 16 ст. ўладанні Ц. прыйшлі ў заняпад і завяваны ўзбекамі. Адзін з Ц. — *Бабур* — заснаваў у 1526 у Індыі дынастыю *Вялікіх Маголаў*.

ЦІМЧУ́К Іван Мацвеевіч (14.2.1901, с. Грушка Івана-Франкоўскай вобл., Украіна — 16.10.1982), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыят. падполля і партыз. руху на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, дзярж. дзеяч Беларусі. Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Смаленскае ваенна-паліт. вучылішча (1924),

І.М.Цімчук.

Харкаўскі камуніст. ун-т імя Арцёма (1929), Вышэйшую парт. школу пры ЦК КПСС (1956). У Чырв. Арміі з 1919. Удзельнік грамадз. вайны, баёў на Паўд. фронце, пасля на гасп. рабоце. У Вял. Айч. вайну з 1941 вёў падп. дзейнасць у Лагойскім р-не, у лют. 1942 — лют. 1943 камісар партыз. атрада «Мсцівец», адначасова з ліст. 1942 сакратар Лагойскага падп. райкома КП(б)Б, з вер. 1943 камісар, у маі—ліп. 1944 камандзір 1-й антыфаш. партыз. брыгады ў Мінскай вобл. У 1944—59 нам. старшыні Дзяржплана БССР, у 1960—68 старшыня Дзярж. к-та СМ БССР па ахове прыроды. Аўтар успамінаў.

ЦІН, Ціна, Ціній, у міфалогіі і рэлігіі стараж. *этрускаў* бог неба, грамавержац. Паводле міфаў, ён карыстаўся 3 пучкамі маланак: 1-м перасцерагаў людзей, 2-м караў іх пасля нарады з 12 інш. багамі, 3-м, самым страшным, караў грэшнікаў толькі са згоды выбраных багоў. Стараж. грэкі атаясамлівалі Ц. з *Зеўсам*, рымляне — з *Юпітэрам*.

ЦІНКТО́РЫС, Тынкторыс (Tinctoris) Іаханес (Іаан; каля 1435 ці 1445, г. Нівель, Бельгія — да 12.10.1511), франка-фламандскі музычны тэарэтык, кампазітар. З 1472 служыў пры двары неапалітанскага караля Фердынанда I. У сваіх трактатах (захавалася 12) развіваў піфагарэйскае вучэнне пра лічбавую аснову музыкі, выклаў агульныя правілы кантрапункта, пытанні рытму і інш. Аўтар першага ў Еўропе сістэм. муз.-тэрміналагічнага слоўніка «Вызначальнік музычных тэрмінаў» (1474). Сярод твораў месы, матэты, шансон.

ЦІР СТРАЛКО́ВЫ (франц. tir), закрытае ці паўзакрытае памяшканне для вучэбнай і трэніровачнай стральбы з ручной агнястрэльнай і пнеўматычнай

зброі. Мае стралковы павільён з агнявой зонай і куляпрыёмнік. Памеры Ц. па далёкасці звычайна не перавышаюць 400 м для баявой, 100 м для малакалібернай і 25 м для пнеўматычнай зброі. На Беларусі 1 стралкова-спарт. стрэльбішча, 10 стралкова-спарт. комплексаў, 45 ціраў (25 і 50 м). Найбольшыя: *спартыўна-стралковы комплекс* імя С.К.Цімашэнкі (Мінск), ціры «Дынама» (Мінск, Гродна), спарт.-стралковы комплекс аб'яднання «Азот» (г. Гродна). *У.Ф.Чайка.*

ЦІРА́СПАЛЬ, горад у Малдове, на р. Днестр. Засн. ў 1792 на месцы стараж. малд. паселішча Старая Суклея. У 1929—40 сталіца Малдаўскай АССР. 192,1 тыс. ж. (1998). Чыг. станцыя. Прам-сць: харч. (кансервавая, пладова-агароднінная, вінна-каньячная, мясная), машынабудаванне (электрарухавікі, трансфарматары, аўтапрычэпы, ліцейныя машыны і інш.), тэкст. (баваўняная, воўнапрадзільная), швейная, дрэваапр., у т.л. мэблевая, хімічная. ДРЭС. Пед. ін-т. Тэатр. Музеі: гіст.-краязнаўчы, карціннай галерэя.

ЦІРКУ́ШКАВЫЯ (Glareolidae), сямейства птушак атр. сеўцападобных. 2 падсям.: ц і р к у ш к і (Glareolinae), маюць 2 роды, 8 відаў і б е г у н к і (Cursoriinae) — 3 роды, 6 відаў. Пашыраны ў Паўд. Еўропе, Азіі, Афрыцы і Аўстраліі. Жывуць на лугах, у пустынях, стэпах, па далінах рэк. На Беларусі 1 рэдкі залётны від — ціркушка стэпавая (Glareola nordmanni), занесеная ў Чырв. кнігу.

Даўж. 17—28 см, маса да 110 г. Паводле складу цела нагадваюць *ластавак*: крылы доўгія, вострыя, хвост з выразкай (у ціркушак) ці прамы або злёгку закруглены (у бегункоў). Разрэз рота шырокі. Нясуць 1—5 яец. Кормяцца пераважна насякомымі.

Э.Р.Самусенка.

ЦІРО́ЛЬ (Tyrol, Tirol), гістарычная вобласць у Еўропе, у Альпах з нямецкамоўным насельніцтвам — цірольцамі. У старажытнасці тэр. Ц. насялялі рэты і *ілірыйцы*, каля 15 да н.э. яна заваявана рымлянамі і ўключана ў прав. Рэцыя. У 4—5 ст. н.э. зах. яе частку занялі алеманы, паўн. ў 6 ст. — баварыі, паўд. — лангабарды. У 11—13 ст. Ц. уваходзіў у склад «Свяшчэннай Рым. імперыі», на яго тэр. існаваў шэраг феад. уладанняў (біскупствы Трыент і Брыксен, графства Ц. і інш.). У 1363 графствам Ц. авалодалі *Габсбургі*. У гаспадарцы Ц. вял. ролю адыгрывала жывёлагадоўля, у 15—17 ст. — горная прам-сць (асабліва здабыча серабра, медзі, ртуці). Цераз перавал Брэнер праходзіў важны гандл. шлях, які злучаў Германію з Італіяй.

Значная частка сялянства захоўвала асабістую свабоду і мела сваё прадстаўніцтва ў ландтагу (збіраўся ў г. Інсбрук). Сяляне і рудакопы на чале з М.*Гайсмайрам* прынялі ўдзел у *Сялянскай вайне 1524—26*. Спроба Баварыі захапіць Ц. у час вайны за Ісп. спадчыну прывяла да антыбаварскага паўстання сялян (1703). У час напалеонаўскіх войнаў Ц. далучаны (1805) да Баварыі. Пасля паражэння паўстання (1809) супраць франка-баварскай акупацыі Ц. падзелены паміж Баварыяй, Італьян. каралеўствам і Ілірыйскімі правінцыямі. Паводле Венскага кангрэса 1814—15 Ц. далучаны да Аўстрыйскай імперыі Габсбургаў. У канцы 19 — пач. 20 ст. у паўд. частцы Ц. распаўсюдзіўся *ірэдэнтызм*. Паводле Сен-Жэрменскага мірнага дагавора 1919 Ц. падзелены паміж Аўстрыяй і Італіяй.

ЦІС (Taxus), род хвойных раслін сям. цісавых. Каля 10 відаў. Пашыраны ў Паўн. паўшар'і. Растуць у хвойных ці хвойна-шыракалістых лясах, радзей утвараюць чыстыя зараснікі. На Беларусі інтрадукаваны 3 віды Ц.: востраканцовы, ці далёкаўсходні (T.cuspidata), канадскі (T.canadensis) і ягадны, або еўрапейскі (T.baccata).

Двух-, радзей аднадомныя вечназялёныя кусты і дрэвы выш. 6—32 м, дыям. ствала 1—2,5 м. Жыве 3—4 (магчыма, больш) тыс. гадоў. Крона шырокаканічная. Характэрна адсутнасць у лісці і драўніне смаляных ходаў. Ігліца лінейная, адзіночная, размешчана спіральна або ў 2 рады. Мужчынскія каласкі адзіночныя, шарападобныя, жан. шышачкі адзіночныя, маюць 1 семя, апушчанае ў мясісты бакалападобны прынасеннік накшталт ягады; пры выспяванні чырв., ружовы, радзей жоўты. Уся расліна ядавітая. Драўніна («чырвонае дрэва») шчыльная, трывалая, устойлівая да гнення і паражэння насякомымі і грыбамі; выкарыстоўваюць у мэблевай і такарнай вытв-сці. Тэхн. і дэкар. расліны.

ЦІ́СА (венг. Tisza, серба-харвацкае Tisa), рака ў Румыніі, Украіне, Славакіі, Венгрыі, Сербіі і Чарнагорыі, левы, самы доўгі прыток Дуная. Даўж. 966 км, пл. бас. 157,1 тыс. км^2. Вытокі ва Усх. Карпатах, цячэ пераважна па Сяроднедунайскай раўніне. Асн. прытокі: Самаш, Кёрэш, Мараш (злева). Веснавое разводдзе, летнія дажджавыя паводкі. Сярэдні расход вады 810 м^3/с. Выкарыстоўваецца для арашэння. ГЭС. Суднаходная да г. Цісакарад (Венгрыя). На Ц. гарады Сольнак, Сегед (Венгрыя).

Ціркушкавыя: 1 — ціркушка стэпавая; 2 — бегунок звычайны.

1 2

ЦІСК, фізічная велічыня, што характарызуе напружаны стан суцэльнага асяроддзя або інтэнсіўнасць нармальных (перпендыкулярных да паверхні сіл), з якімі адно цела дзейнічае на паверхню другога; адзін з асн. *параметраў стану* вадкасці і газу.

Пры раўнамерным размеркаванні нармальнай сілы F на паверхні Ц. p на любую частку паверхні роўны $p = F/S$, дзе S — плошча гэтай часткі; пры нераўнамерным размеркаванні велічыня F/S вызначае сярэдні Ц. на дадзеную плошчу. Рознасць Ц. вымяраюць *манометрамі*, абс. (у прыватнасці атм.) — *барометрамі*, хуткапераменлівы — разнастайнымі эл. датчыкамі. Адзінка Ц. ў СІ — *паскаль*, пазасістэмныя адзінкі — *міліметр вадзянога слупа* і *міліметр ртутнага слупа*.

Ціс ягадны.

ЦІСК ГУКАВО́ГА ВЫПРАМЯНЕ́ННЯ, р а д ы я ц ы й н ы ц і с к г у к у, ц і с к г у к у, пастаянны ціск, які дзейнічае на цела, што знаходзіцца ў стацыянарным гукавым полі. Прапарцыянальны шчыльнасці гукавой энергіі. Малы ў параўнанні з *гукавым ціскам*. Выкарыстоўваецца для вызначэння абс. значэння *інтэнсіўнасці гуку*.

ЦІСК СВЯТЛА́, с в е т л а в ы ц і с к, ціск, які ўтварае святло на адбівальныя і паглынальныя целы, часцінкі, асобныя малекулы і атамы; асобны выпадак *пандэраматорнага дзеяння святла*. Гіпотэзу аб існаванні Ц.с. выказаў І.*Кеплер* (1619), тэарэтычна яго значэнне прадказаў Дж.К.*Максвел* (1873), эксперыментальна вызначыў П.М.*Лебедзеў* (1899).

З пазіцый квантавай тэорыі Ц.с. — вынік перадачы фатонамі імпульсу паглынальным і адбівальным целам. Мае важнае значэнне ў астр. і атамных з'явах. Ц.с. нараўне з ціскам газаў забяспечвае стабільнасць зорак процідзеянню сілам гравітацыйнага сціскання, істотны для дынамікі калязорнага і міжзорнага газаў. Наўянасцю Ц.с. тлумачацца некаторыя формы каметных хвастоў (гл. *Кометы*) і інш. Да эфектаў Ц.с. адносяць «светлавую аддачу» ўзбуджанага атама пры выпрамяненні фатона, да іх блізкая з'ява перадачы гама-квантамі часткі свайго імпульсу электронам, на якіх яны рассейваюцца (гл. *Комптана эфект*), а таксама ядрам атамаў крышталёў у працэсах выпрамянення і паглынання (гл. *Мёсбаўэра эфект*). Пасля стварэння *лазераў* Ц.с. выкарыстоўваецца для рашэння шэрагу важных задач, у т.л. для тэрмаядз. даследаванняў, напр., раздзялення ізатопаў і мікрачасцінак рэчыва па памерах, іх паскарэння да вял. скарасцей, стварэння «аптычных пастак», дзе часцінкі з высокім даказчыкам пераламлення знаходзяцца ў стане ўстойлівай раўнавагі, і інш. *П.С.Габец.*

ЦІ́СКУ ДА́ТЧЫК, адзін з тыпаў *вымяральных пераўтваральнікаў*, які ціск вадкасці ці газу, перапады (рознасць) ціскаў пераўтварае ў эл., пнеўматычны ці інш. сігналы. Будуюцца паводле прынцыпу прамога пераўтварэння вымяральнага ціску ў выхадны сігнал (напр., магнітапругкія і п'езаэл. датчыкі) або з выкарыстаннем прамежкавых пераўтваральнікаў у мех. перамяшчэнне і канцавых пераўтваральнікаў, уваходная велічыня якіх — мех. перамяшчэнне. Прамежкавыя пераўтваральнікі — *мембраны, сільфоны*, спружыны і інш.

ЦІСНЕ́ННЕ, тэхніка атрымання рэльефных выяў на паверхні скуры, аксаміту, ліставога металу, бяросты і інш. матэрыялаў выціскваннем штампамі; вырабы ў гэтай тэхніцы. Ц. па метале вядома ў мастацтве Стараж. Егіпта і інш. краін Стараж. свету. Пазней Ц. пашырылася ў інш. краінах. На Беларусі Ц. па скуры і метале вядома з 11—13 ст. Ц. па скуры рабілі з малюнкам пераважна геам. характару, па метале дадаткова аздабляліі зярненнем, гравіраваннем, чарненнем і інш. Высокімі маст. якасцямі вызначаюцца скураныя пераплёты кніг 16 ст. Ф.Скарыны і П.Мсціслаўца. У 1-й пал. 17 ст. тэхн. ўзровень Ц. па скуры знізіўся, у 18 ст. палепшыўся, аднак малюнак стаў менш выразны, здробнены. Багатыя выданні аздабляліі залатым Ц., часам з падфарбоўкай, дэкарыравалі скураныя футляры для акуляраў, ключоў і інш., конскую вупраж, шпалеры, завесы і інш. Ц. па ляўкасе з наступнай пазалотай характэрна для фонаў абразоў 17—18 ст. Значна пашырылася басма (ручное Ц. па тонкім ліставым метале), якой аздабляліі пераплёты кніг, аблокады абразоў і інш. У нар. побыце тэхнікай Ц. ўпрыгожвалі *берасцяныя вырабы*. У наш час Ц. аздабляюць вырабы з бяросты, скуры і інш.

У паліграфіі Ц. атрымліваюць адбітак малюнка або шрыфту на пераплётнай крышцы, паперы або кардоне. Выконваецца на пазалотным прэсе. Адрозніваюць Ц. рэльефнае і плоскапаглыбленае. Выкарыстоўваецца таксама плоскі штамп з цынку або латуні. Ц. можа быць бясфарбавае або фарбавае (выява ўтвараецца з дапамогай спец. фарбавай ці металізаванай фольгі, якая застаецца ў паглыбленнях).

Літ.: Кацер М.С. Народно-прикладное искусство Белоруссии. Мн., 1972.

Я.М.Сахута.

Цісненне па скуры. Шабета. Магілёўшчына. 19 ст.

ЦІСЭ́ (Тысэ) Эдуард Казіміравіч (13.4.1897, г. Ліепая, Латвія — 18.11.1961), расійскі і латвійскі кінааператар; адзін з заснавальнікаў рас. аператарскай школы. Засл. дз. маст. Расіі (1935). Засл. дз. маст. Латвіі (1947). З 1914 здымаў першыя латв. дакумент. фільмы, хроніку 1-й сусв. вайны, рэпартажы пра падзеі грамадз. вайны. З 1921 выкладаў ва Усесаюзным дзярж. ін-це кінематаграфіі (з 1943 праф.). Рабіў дакумент. здымкі У.І.Леніна (1918—24); аператар фільмаў рэж. С.*Эйзенштэйна* «Стачка» (1925, з В.Хватавым), «Браняносец «Пацёмкін» (1925), «Кастрычнік» (1927), «Старое і новае» (1929), «Аляксандр Неўскі» (1938), «Іван Грозны» (2-серыйны, 1945; 2-я серыя з А.Масквіным). Інш. работы: «Сустрэча на Эльбе» (1949), «Кампазітар Глінка» (1952). Рэжысёр (з З.Аграненка) і аператар фільма «Бессмяротны гарнізон» (1956). Дзярж. прэміі СССР 1946, 1949, 1950.

Літ.: Десять операторских биографий. Вып. 1. М., 1978.

ЦІТ Флавій Веспасіян (Titus Flavius Vespasianus; 30.12.39—13.9.81), рымскі імператар [79—81]. З дынастыі *Флавіяў*. Сын і пераемнік *Веспасіяна*. У час *Іудзейскай вайны 66—73* камандаваў легіёнам у арміі бацькі. Пасля абвяшчэння Веспасіяна імператарам (69) прыняў ад яго камандаванне ў Палесціне. У 70 задушыў паўстанне іудзеяў і разбурыў Іерусалім. З 71 прэфект прэтарыянскай гвардыі і суправіцель Веспасіяна. У 73—74 цэнзар, правіў у згодзе з сенатам. Ц. расходаваў значныя сродкі на ліквідацыю вынікаў вывяржэння Везувія 24.8.79, мору і пажару ў Рыме ў 80, буд-ва тэрмаў. Памёр ад ліхаманкі.

Літ.: Светоний Г.Т. Жизнь двенадцати цезарей: Пер. с лат. М., 1990; Федорова Е.В. Императорский Рим в лицах. 2 изд. Смоленск, 1995.

І.Ціта.

ЦІ́ТА, Броз Ціта (Broz Tito) Іосіп (25.5.1892, в. Кумравец, Харватыя — 4.5.1980), дзяржаўны і паліт. дзеяч Югаславіі. Маршал (1943), тройчы Нар. герой (1944, 1972, 1977), Герой Сац. Працы (1950) Югаславіі. Удзельнік 1-й сусв. вайны (на баку Аўстра-Венгрыі) і Кастр. рэвалюцыі 1917 у Расіі (дзе быў у палоне). Чл. (з 1920), ген. сакратар (з 1940), старшыня (з 1966) Камуніст. партыі Югаславіі (з 1952 Саюз камуністаў Югаславіі). У час *народна-вызваленчай вайны ў Югаславіі 1941—45* галоўнакаманд. Нар.-вызв. арміяй і партыз. атрадамі (1941—45), старшыня Нац. к-та вызвалення Югаславіі (1943—45). Узнагароджаны сав. ордэнам «Перамога». Кіраўнік урада (1945—63), прэзідэнт (1953—80) Югаславіі. У перыяд часовага (1948—55) разрыву сав.-югасл. міждзярж. і міжпарт. сувязей Ц. актывізаваў кантакты з краінамі—членамі НАТО, супрацьстаяў ідэалаг. і паліт. націзму СССР і прапанаваў уласную мадэль сацыяліст. грамадства, засн. на дэцэнтралізацыі кіраўніцтва гасп. дзейнасцю. На міжнар. арэне прыхільнік пазаблокавай палітыкі, адзін з заснавальнікаў *недалучэння руху*. З 1955 адрадзіў дружалюбныя адносіны з СССР пры прызнанні апошнім своеасаблівасці югасл. мадэлі сацыялізму і неўмяшання ва ўнутр. справы адзін аднаго. У 1965 наведаў Беларусь.

Тв.: Рус. пер. — Избранные статьи и речи, май 1941 — окт. 1979 г. М., 1987.

Літ.: Уэст Р. Иосип Броз Тито: Власть силы: Пер. с англ. Смоленск, 1998.

ЦІ́ТА РУ́ФА (Titta Ruffo, сапр. Ціта Руфа Каф'ера; 8.6.1877, г. Піза, Італія — 6.7.1953), італьянскі спявак (барытон). У 1898—1931 спяваў на оперных сцэнах Італіі і інш. краін. Буйнейшы спявак 20 ст., валодаў голасам рэдкай прыгажосці, драм. талентам. У рэпертуары каля 60 рознахарактарных партый: Рыгалета, Яга («Рыгалета»,

«Атэла» Дж.Вердзі), Гамлет («Гамлет» А.Тама), Фігара («Севільскі цырульнік» Дж.Расіні), Скарпія («Тоска» Дж.Пучыні), Тоніо, Эдып («Паяцы», «Цар Эдып» Р.Леанкавала), Мефістофель («Фауст» Ш.Гуно), Барыс Гадуноў («Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага), Дэман («Дэман» А.Рубінштэйна) і інш. Аўтар успамінаў.

Тв.: Рус. пер. — Парабола моей жизни. 3.изд. Л., 1990.

ЦІТАВЕ́Ц Эрнст Пятровіч (н. 6.5.1939, г. Краснаярск, Расія), бел. вучоны ў галіне медыка-біял. навук. Д-р біял. н. (1984), праф. (1988). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1963), дзе і працаваў. З 1968 у НДІ неўралогіі, нейрахірургіі і фізіятэрапіі (з 1975 заг. лабараторыі). Навук. працы па гіпаксіі тканак, патагенет. механізмах гіпаксіі, спосабах фармакалагічнай карэкцыі гіпаксічных парушэнняў метабалізму.

Тв.: Окисление 4-анилино-5-метокси-1,2-диоксибензола в сложных биохимических системах, обладающих супероксиддисмутазной активностью // Биохимия. 1979. Т. 44, вып. 8; Аквапорины // Здравоохранение. 2002. № 1; Experimental study on brain oxygenation in relation to tissue water redistribution and brain oedema (у сааўт.) // Springer-Verlag // Acta Neurochirurgica (Suppl). 2000. Vol. 76.

ЦІТАРЭ́НКА Ларыса Рыгораўна (н. 11.3.1953, Мінск), бел. сацыёлаг і філосаф. Д-р сацыялаг. н. (1993), канд. філас. н. (1978), праф. (1995). Скончыла БДУ (1975) і працуе ў ім з 1978. Навук. працы па праблемах сац. тэорыі, трансфармацыі і дэмакратызацыі постсав. грамадства, сацыялізацыі моладзі, гендэрнай сацыялогіі. Распрацоўвае новы кірунак сацыялаг. даследаванняў, звязаны з аналізам СНІДу як глабальнай пагрозы чалавецтву.

Тв.: Знание. Компьютер. Общество. Мн., 1992 (разам з У.А.Гераіменкам, А.А.Лазарэвічам); Технократические концепции в западной социологии. Мн., 1993; Социологическая теория. Мн., 1994 (разам з С.В.Лапінай); Моральные ценностей современной молодежи: к глобальной интеграции. М., 1994 (у сааўт.); Values and post-soviet youth: Problems of transition. Milan, 1995 (у сааўт.); Global trends in women's access and leadership. Washington, 2000; Гендерная социология. Мн., 2003.

ЦІ́ТАЎКА, рака ў Пухавіцкім р-не Мінскай вобл., правы прыток р. Свіслач (бас. р. Дняпро). Даўж. 33 км. Пл. вадазбору 372 км². Пачынаецца з р. Пціч за 1,5 км на ПдУ ад в. Русаковічы, вусце ў в. Пухавічы. Цячэ па зах. ускраіне Цэнтральнабярэзінскай раўніны. Даліна ў верхнім і сярэднім цячэнні невыразная, у нізоўі трапецападобная або скрынкападобная са стромкімі схіламі. Пойма ў верхнім і сярэднім цячэнні адсутнічае, у ніжнім вузкая, месцамі адсутнічае, шыр. 500—800 м. Рэчышча шыр. 10—20 м, ад вытоку да в. Загай на працягу 16 км каналізаванае. На рацэ г. Мар'іна Горка.

ЦІТКО́Ў Іван Піліпавіч (27.8.1912, с. Слабада Бялёўскага р-на Тульскай вобл., Расія — 23.7.1982), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Вял. Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Новасібірскі буд. ін-т (1939), Вышэйшую парт. школу пры ЦК ВКП(б) (1950), Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1953). З 1941 на фронце. У чэрв. 1942 накіраваны ў варожы тыл. У кастр. 1942 — чэрв. 1944 камандзір партыз. брыгады «Жалязняк» Мінскай вобл. У 1945—72 на парт. і гасп. рабоце. Аўтар кн. «Брыгада «Жалязняк» (2-е выд. 1982).

ЦІТЛА (ад грэч. titlos надпіс), надрадковы знак, які ўжываўся ў стараж. (грэч., слав.) пісьменнасці і ўказваў на скарочанае напісанне слоў або лікавае значэнне літар.

У старабел. пісьменнасць Ц. перайшла са стараж.-рускай. Спачатку мела форму, блізкую да простай гарыз. рыскі над словам, потым колькасць яе варыявала, павялічылася. Звычайна пісалася над агульнавядомымі кніжнымі словамі, дзе апускаліся пераважна літары, якія абазначалі галосныя гукі: «глсъ» («голосъ»), «днь» («день»), «крсть» («крестъ»), «снъ» («сынъ»), «цръ» («царъ»). Ужывалася над літарамі, якія абазначалі лікі і даты («купили жита 3 копъ», «розделъ кг», «року ѫ афмє месяца мая їі дня»), над вынаснымі літарамі («пра҃да», «ча҃»). Розныя графічныя варыянты Ц. служаць палеаграфічнай прыкметай пры датаванні стараж. рукапісаў.

А.М.Булыка.

ЦІТМА́Р МЕРЗЕБУ́РГСКІ (Thietmar von Merseburg, 25.7.975—1.12.1018), нямецкі хранікіст. Сваяк імператараў «Свяшчэннай Рым. імперыі» з Саксонскай дынастыі. З 1009 біскуп мерзебургскі. Хроніка Ц.М. (на лац. мове) ахоплівае перыяд ад праўлення імператара Генрыха I Птушкалова [912—936] да 1018, найб. каштоўныя звесткі ў ёй пра часы праўлення імператараў Атона III [996—1002] і Генрыха II [1014—24], пра герм.-слав. адносіны і асобныя падзеі з гісторыі *Кіеўскай Русі*. Ц.М. — прыхільнік моцнай імператарскай (каралеўскай) улады, апалагет заваёўніцкай палітыкі ў адносінах да слав. народаў.

ЦІТО́ВІЧ Барыс Барысавіч (н. 28.6.1948, г. Коркіна Чэлябінскай вобл., Расія), бел. мастак. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1972). Працуе ў станковай і кніжнай графіцы, манум. жывапісе, іканапісе і скульптуры. Аўтар ілюстрацый да кніг: «Людзі на балоце», «Подых навальніцы» (абедзве 1973), «Завеі, снежань» (1978) І.Мележа, «Дзве аповесці» В.Казько (1977), «Пушча» В.Карамазава (1979), «Марат Казей» П.Броўкі (1980), зб. вершаў і паэм «Песня свабоды» Я.Купалы на малд. мове (1982), «Летуценнік», «Смутак белых начэй» (абедзве 1985) І.Навуменкі, «Ля крыніцы: Аповесці» Я.Брыля (1986), «Зеніт» І.Шамякіна (1987) і інш.; графічных серый «Памяці Брэста» (1975), «Поры года» (1978), «Салдацкім удовам прысвячаецца» (1981), «Мае аднавяскоўцы» (1982), «Сялянскі накцюрн» (1983), «Тыя, хто перанёс вайну» (1985), «Хроніка з нататкамі на палях» (1986), серыі помнікаў ахвярам 1-й і 2-й сусв. войнаў у Вілейскім р-не Мінскай вобл., размалёўкі царквы ў г. Вілейка (2002—03), абразоў. Адзін са стваральнікаў і мастак-пастаноўшчык (з 1975) Нарачанскага ўзорнага дзіцячага т-ра «Ялінка».

ЦІТО́ВІЧ Генадзь Іванавіч (7.8.1910, в. Новы Пагост Міёрскага р-на Віцебскай вобл. — 20.6.1986), бел. этнамузыказнавец, дзеяч харавога мастацтва, дырыжор. Нар. арт. Беларусі (1955). Нар. арт. СССР (1968). Скончыў Віленскую кансерваторыю (1939), вывучаў этнаграфію ў Віленскім ун-це (1936—39). У 1939—41 і 1944—51 рэдактар абл. радыё, кансультант Дома нар. творчасці ў Баранавічах. У 1939 сфарміраваў і ўзначаліў самадз. Падлескі нар. хор (Ляхавіцкі р-н Брэсцкай вобл.). З 1952 арганізатар і маст. кіраўнік *Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь* (з 1988 яго імя). У 1974—76 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі. Збіраў і вывучаў бел. муз. фальклор, запісаў каля 3 тыс. нар. песень і танцаў. Складзеныя ім зборнікі ўласных запісаў ахопліваюць усе асн. меладычныя стылі і жанры бел. нар. песні. Аўтар 12 арыгінальных песень на ўласныя словы і вершы бел. паэтаў, больш за 60 апрацовак бел. нар. мелодый («Жавароначкі, прыляціце», «Ой, рана на Івана», «Рэчанька» і інш.). У тэарэт. працах параўнальнае даследаванне муз. творчасці слав. народаў, аналіз бел. нар. шматгалосся, нар. выканальніцтва, стыляў сучаснай нар. песні. Аўтар прац «Беларускія народныя песні» (двухгалосыя, 1948), «Песні шчасця» (сучасныя бел. нар. песні, 1950), «Песні беларускага народа» (1959), «Сучасная беларуская песня» (1961), «Польскія народныя песні» (выбраныя, 1962), «Новыя стылявыя рысы традыцыйнай беларускай народнай песні» (1964), «Анталогія беларускай народнай песні» (1968, 2-е выд. 1975), «Аб беларускім песенным фальклоры: Выбраныя нарысы» (1976), зб. «Добры вечар!» (1986). Муз. рэдактар тамоў «Радзіннай паэзіі» (1971), «Жартоўныя песні» (1974) з шматтомнага выдання *«Беларуская народная творчасць»*, а таксама аўтар тэле- і радыёперадач і інш. Прэмія Ленінска-

І.П.Ціткоў.

Г.І.Цітовіч.

га камсамола Беларусі 1968. Дзярж. прэмія Беларусі 1978.

Літ.: Жураўлёў Дз.М. Генадзь Цітовіч. Мн., 1960; Яго ж. Геннадий Цитович. Мн., 1984. *Дз.М.Жураўлёў.*

ЦІТО́ВІЧ Ігар Сяргеевіч (30.6.1917, г. Горкі Магілёўскай вобл. — 12.6.1985), бел. вучоны ў галіне машынабудавання.

І.С.Цітовіч.

Чл.-кар. АН Беларусі (1974), д-р тэхн. н., праф. (1970). Засл. дз. нав. і тэхн. (1972). Скончыў БПІ (1940), дзе выкладаў з 1945 (з 1951 заг. кафедры). З 1973 дырэктар, з 1978 нам. дырэктара Ін-та праблем надзейнасці і даўгавечнасці машын АН Беларусі. Навук. працы па праектаванні надзейных асн. агрэгатаў аўтамабіляў, трактароў і лакаматываў. Стварыў методыкі разліку валоў шасцерняў, падшыпнікаў. Пад яго кіраўніцтвам распрацавана тэорыя пабудовы электронных мадэлей трансп. і цягавых машын на ЭВМ.

Тв.: Кинематика и долговечность подшипников качения машин и приборов. Мн., 1977 (у сааўт.); Трансмиссии автомобилей. Мн., 1979 (разам з І.У.Канонікам, В.А.Вавулам).

ЦІТО́Ў Аляксандр Дзмітрыевіч (н. 23.6.1952, с. Святвозера Пражынскага р-на, Карэлія), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1994). Чл. Нью-Йоркскай АН (1994). Скончыў БДУ (1976). З 1976 у НДІ прыкладных фіз. праблем БДУ. З 1998 дырэктар выд-ва «ТэтраСістэмс». Навук. працы па оптыцы, электрадынаміцы, лазернай фізіцы. Даследаваў аптычныя ўласцівасці тэтраэдрычных адбівальнікаў зваротнага дзеяння ў форме люстрана-сім. вуглоў, распрацаваў лікавыя алгарытмы аптымізацыі іх характарыстык, шэраг новых аптычных элементаў.

Тв.: Передаточные функции для комплексной амплитуды поля световозвращателей в форме трехгранных углов // Оптика и спектроскопия. 1993. Т. 74, № 2; Устройство для поляризационной развязки возвратного действия // Журн. техн. физики. 1994. Т. 64, вып. 11.

ЦІТО́Ў Васіль Палікарпавіч (каля 1650—1710?), рускі кампазітар. Гасударaў пеўчы дзяк. Майстар рус. хар. музыкі, сцвердзіў у ёй шматгалосы стыль *партэсных спеваў*, замацаваў у практыцы тэарэт. палажэнні М.*Дылецкага*. Напісаў каля 30 хар. духоўных канцэртаў (8—12-галосых), музыку да «Псалтыра рыфматворнага» (1680) з выкарыстаннем мелодыкі бел. *знаменнага спеву* і «Месяцаслова» Сімяона Полацкага. Гэтыя творы Сімяона Полацкага — Ц., пашыраныя ў побыце да 1-й пал. 19 ст., адыгралі прыкметную ролю ў станаўленні рус. кантавай культуры.

ЦІТО́Ў Віктар Сцяфанавіч (н. 15.11.1938, в. Дрожджаніцы Крычаўскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. этнограф, гісторык, педагог. Д-р гіст. н. (1991), праф. (1995). Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1963). З 1963 настаўнічаў, працаваў у Мін-ве асветы Беларусі. З 1974 у Гродзенскім пед. ін-це, з 1977 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі. З 1993 заг. кафедры Бел. ун-та культуры, з 1998 — Бел. пед. ун-та. Распрацаваў канцэпцыю гісторыка-этнагр. раянавання Беларусі. Даследуе тыпалогію культ. ландшафтаў, гіст. стасункі Беларусі і сумежных тэрыторый, бел. дыяспару, этн. гісторыю і геаграфію Беларусі, традыц. нар. культуру, гісторыю нар. адукацыі, праблемы нац. узаемаадносін і інш. Адзін з аўтараў прац «Праблемы рассялення ў БССР» (1980), «Помнікі этнаграфіі» (1981), «Промыслы і рамёствы Беларусі» (1984), «Палессе: Матэрыяльная культура» (1988), «Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі» (1993), «Адраджэнне традыцыйнай мастацкай культуры Палесся» (1994), «Беларусы» (т. 1, 1995), «Беларусы» (1998), «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» (т. 1, 2001), «Гісторыя сялянства Беларусі» (т. 2, 2002). Навук. рэдактар і сааўтар энцыклапедычнага даведніка «Народная культура Беларусі» (2002), зб. «Народныя традыцыі і нацыянальная культура» (кн. 1—2, 2001—03). Удзельнічаў у распрацоўцы навук.-метадычных прынцыпаў аховы помнікаў, арганізацыі музеяў-скансенаў (Бел. дзярж. музей нар. архітэктуры і побыту, Нарачанскі нац. парк і інш.), складанні «Нацыянальнага атласа Беларусі» (2002).

Тв.: Народные деревообрабатывающие промыслы Белоруссии (1917—1941 гг.). Мн., 1976; Историко-этнографическое районирование материальной культуры белорусов, XIX — начало XX в. Мн., 1983; Народная спадчына: Матэрыял. культура ў лакальна-тыпал. разнастайнасці. Мн., 1994; Этнаграфічная спадчына: Беларусь: Традыцыйна-бытавая культура. 2 выд. Мн., 2001; Этнаграфічная спадчына: Беларусь: Краіна і людзі. 2 выд. Мн., 2001.

ЦІТО́Ў Герман Сцяпанавіч (11.9.1935, с. Верхняе Жыліна Касіхінскага р-на Алтайскага краю, Расія — 20.9.2000), савецкі касманаўт. Герой Сав. Саюза (1961). Лётчык-касманаўт СССР (1961). Ген.-палк. авіяцыі (1988). Канд. ваен. н. (1980). Скончыў ваен.-авіяц. вучылішча лётчыкаў (1957), Ваенна-паветр. інж. акадэмію імя Жукоўскага (1968), Ваен. акадэмію Генштаба (1972). У 1960—70 у Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў імя Гагарына. 6—7.8.1961 здзейсніў 2-і ў свеце касм. палёт на караблі «Усход-2». У космасе правёў 1,05 сут. Ленінская прэмія 1988. Залаты медаль імя Цыялкоўскага АН СССР. Яго імем названы кратэр на Месяцы. У 1972—91 на кіруючых пасадах ва Упраўленні касм. сродкаў Мін-ва абароны СССР.

Тв.: 700 000 километров в космосе. М., 1961; Семнадцать космических зорь. М., 1962; Авиация и космос. М., 1963; Голубая моя планета. [2 изд.] М., 1982; На звездных и земных орбитах. М., 1987. *У.С.Ларыёнаў.*

Г.С.Цітоў.

І.Т.Цітоў.

ЦІТО́Ў Іван Трафімавіч (4.3.1875, г. Радамышль Жытомірскай вобл., Украіна — 27.11.1949), бел. вучоны-патолагаанатам. Акад. АН Беларусі (1940), д-р мед. н. (1934), праф. (1927). Засл. дз. н. Беларусі (1939). Скончыў Кіеўскі ун-т (1898), дзе і працаваў у 1912—23. З 1923 у БДУ (заг. кафедраў). З 1946 у Ін-це тэарэт. і клінічнай медыцыны АН Беларусі (заг. аддзела). Навук. працы па паталаг. анатоміі чумы, склеромы, раку, эндэмічнага валляка, хвароб сардэчна-сасудзістай і дыхальнай сістэм, эпідэмічнага менінгіту, высвятленні ролі гельмінтаў у паталогіі чалавека.

Тв.: Руководство для практических занятий по патологической гистологии. Мн., 1924; Асновы паталагічнай анатоміі. Ч. 1—2. Мн., 1935—37.

ЦІТО́Ў Канстанцін Маркавіч (26.10.1905, с. Сачкавічы Клімаўскага р-на Бранскай вобл., Расія — 13.4.1972), рускі паэт, перакладчык. Скончыў Ленінградскі ун-т (1937). Друкаваўся з 1927. У зб-ках паэзіі «Выступленне ў дарогу» (1941), «Салдацкія радкі» (1947), «Шукальнікі» (1956), «Сэрца зямлі» (1958), «Проста пра любоў» (1970), «Сляды на водмелі» (1972) услаўленне чалавека-працаўніка, гераізму сав. воінаў у Вял. Айч. вайне, хараства прыроды, дружбы, кахання. Яго творы вызначаюцца лірызмам, маляўнічасцю дэталей, разнастайнасцю жанраў, многія напісаны ў сюжэтна-баладнай форме. Аўтар тэкстаў песень, кніг для дзяцей. На рус. мову пераклаў творы бел. паэтаў, трылогію Р.Сабаленкі «Іду ў жыццё» (1963).

Тв.: Солнце загорается за Сожем. Мн., 1978.

ЦІТО́Ў Леанід Пятровіч (н. 3.10.1946, в. Міхайлавічы Горацкага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне імуналогіі, алергалогіі, мікрабіялогіі і віруса-

логіі. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (2000), д-р мед. н. (1991), праф. (1993). Вучань А.П.*Красільнікава*. Скончыў Мінскі мед. ін-т (1975), дзе працаваў з 1978 (з 1988 заг. кафедры), адначасова гал. імунолаг Мін-ва аховы здароўя Беларусі. З 1995 дырэктар Бел. НДІ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі (адначасова з 1998 кіраўнік аддзела і лабараторыі). Навук. працы па вывучэнні натуральнага імунітэту пры першасна-хранічных інфекц. захворваннях дыхальнага тракту, туберкулёзе, траўме, аўтаімунных і алергічных захворваннях. Аўтар нац. праграмы «Імунапрафілактыка». Дзярж. прэмія Беларусі 2002.

Тв.: Слоўнік па агульнай і медыцынскай вірусалогіі. Мн., 1995 (разам з А.П.Красільнікавым, Н.Ф.Казак); Бешенство и другие лиссавирусные инфекции человека: Пробл. иммуно- и химиотерапии. Мн., 2002 (разам з Н.П.Мішаевай, В.І.Вацяковым); Иммунология: Терминол. словарь. Мн., 2002.

ЦІТО́Ў Пётр Акіндзінавіч (1843—28.8.1894), расійскі караблебудаўнік-самавук. З 1859 у караблебуд. майстэрні Неўскага суднабуд. з-да ў С.-Пецярбургу, дзе прайшоў шлях ад рабочага да карабельнага майстра. Кіраваў буд-вам фрэгата «Генерал-адмірал» (1873), кліпераў «Разбойнік» (1878), «Вяшчун» (1880) і інш. З 1882 гал. інжынер Франка-рус. з-да. Распрацаваў шэраг тэхнал. працэсаў: апрацоўку суднабуд. сталі, разметку і праколку адтулін у лістах, клёпку і інш.; вынайшаў *кесон* для рамонту падводнай часткі корпуса судна без уводу яго ў док. Аўтар праектаў браняносных караблёў.

Літ.: Академик А.Н.Крылов: Воспоминания и очерки. М., 1956.

ЦІТО́Ў Уладзімір Георгіевіч (н. 1.1.1947, г. Срэценск Чыцінскай вобл., Расія), савецкі касманаўт. Герой Сав. Саюза (1988). Лётчык-касманаўт СССР (1983). Палк. авіяцыі (1983). Скончыў Чарнігаўскае вышэйшае ваен. авіяц. вучылішча лётчыкаў (1970), Ваенна-паветр. акадэмію імя Гагарына (1987). У 1976—98 у Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў імя Гагарына. З 1998 кіраўнік рас. прадстаўніцтва амер. кампаніі «Боінг» у Маскве. Здзейсніў 4 палёты ў складзе экіпажаў касм. караблёў (КК): 20—22.4.1983 — на КК «Саюз Т-8», 21.12.1987—21.12.1988 — на КК «Саюз ТМ-4» і арбітальнай станцыі (АС) «*Мір*» (як камандзір; пасадка на КК «Саюз ТМ-6»), 3—11.2.1995 — на КК «Дыскавery», 26.9—7.10.1997 — на КК «Атлантыс» і АС «Мір». У космасе правёў 387 сут, у т.л. ў адкрытым космасе 18,8 гадз (4 выхады). 2 медалі НАСА «За касмічны палёт». *У.С.Ларыёнаў.*

ЦІХААКІЯ́НСКАЯ КАРДЫЛЬЕ́РА, ланцуг вулканічных конусаў у Цэнтр. Амерыцы; другая назва *Вулканічнай Сьеры*.

ЦІХААКІЯ́НСКАЯ СКЛА́ДКАВАСЦЬ. Праявілася ў мезазойскую эру (у канцы юрскага — пач. мелавога перыяду) у раёнах, прылеглых да Ціхага ак. (Усх. Азія, Кардыльеры Паўн. Амерыкі, Анды). Гл. *Мезазойская складкавасць, Ціхаакіянскі геасінклінальны пояс.*

ЦІХААКІЯ́НСКІ ГЕАСІНКЛІНА́ЛЬНЫ ПО́ЯС, найбуйнейшы ўскраінна-мацерыковы рухомы пояс зямной кары, які акаймоўвае Ціхі акіян. Ад ложа акіяна аддзелены сістэмай глыбакаводных жалабоў. Працягласць (па знешнім кальцы) каля 56 тыс. км, шыр. ад соцень да 3—5 тыс. км. Уключае глыбакаводныя жалабы, астраўныя дугі, ускраінныя моры, горныя складкавыя сістэмы Андаў; Кардыльераў Паўн. Амерыкі (з Аляскай); Чукоцкага і Камчацкага п-авоў; Сіхатэ-Аліня; а-воў Сахалін, Японскіх, Тайвань, Філіпінскіх, Новая Гвінея; Паўд.-Усх. Кітая; Усх. Аўстраліі; а-воў Новая Каледонія і Новая Зеландыя; Трансантарктычных гор і Антарктычнага п-ва. Ц.г.п. — поле максімальнай сейсмічнай і вулканічнай актыўнасці Зямлі. Ц.г.п. фарміраваўся з позняга дакембрыю (рыфею), што пацвярджаецца наяўнасцю *афіялітаў* у саставе складкавых сістэм, да пачатку кайназою.

Адэлаідская складкавая сістэма Аўстраліі і яе працяг на в-ве Тасманія і ў Трансантарктычных гарах — найб. ранняй генерацыі, якая завяршылася ў ардовіку; Катазіяцкая сістэма Кітая — у дэвоне, Лахланская ва Усх. Аўстраліі — у познім дэвоне, унутр. зоны Японскіх а-воў, Новай Гвінеі і Новай Зеландыі, Новаанглійская сістэма Усх. Аўстраліі, усх. зоны Цэнтр. Анд, складкавасць Антарктычнага п-ва — у познім палеазоі і раннім мезазоі. Заключныя дэфармацыі ўнутр. зон Кардыльераў Паўн. Амерыкі, на а-вах Японскіх, Новай Гвінеі і Новай Зеландыі адбыліся ў канцы юры — пачатку мелу; складкава-насоўныя структуры Сіхатэ-Аліня і Пенжынска-Анадырскай зоны Каракіі — у познемелавы перыяд; астатняй Каракіі, зах. Камчаткі, усх. Сахаліна, зах. Філіпін, усх. зон Кардыльераў Паўн. Амерыкі і Анд — у ранненапалеагенавы перыяд.

ЦІХААКІЯ́НСКІЯ ВО́ЙНЫ 1864—66 і 1879—83. Вайна 1864—66 вялася паміж Іспаніяй (імкнулася аднавіць сваё панаванне ў краінах Лац. Амерыкі) і паўднёваамер. рэспублікамі — Перу, Чылі, Эквадорам і Балівіяй. У ліп. 1864 ісп. флот захапіў перуанскія а-вы Чынча. На баку Перу ў вер. 1865 выступіла Чылі, у снеж. 1865 да іх далучыліся Эквадор і Балівія. Спроба Іспаніі блакіраваць ціхаакіянскае ўзбярэжжа не мела поспеху, і яна адвяла свой флот. У крас. 1871 заключана перамір'е, у жн. 1879 — мірны дагавор. Вайна 1879—83 выклікана імкненнем Чылі захапіць радовішча селітры ў балівійскай і перуанскай частках пустыні Атакама. У лют. 1879 Чылі напала на Балівію, у крас. ў вайну ўступіла Перу (мела дагавор аб узаемадапамозе з Балівіяй). Чылі падтрымлівала Вялікабрытанія, Балівію і Перу — ЗША. Да канца 1879 чылійцы акупіравалі балівійскае ўзбярэжжа і перуанскую правінцыю Тарапака, у чэрв. 1880 — усю Атакаму, у студз. 1881 занялі сталіцу Перу — г. Ліма; у ліп. 1883 прымусілі Перу падпісаць мірны дагавор, паводле якога Чылі атрымала Тарапаку назаўсёды, а гарады Такна і Арыкі на 10 гадоў (у 1929 Такна вернута Перу). Балівія падпісала ў 1884 перамір'е, паводле якога страціла правінцыю Антафагаста і ў выніку выхад да мора; мірны дагавор, які замацаваў гэтае становішча, падпісаны ў 1904.

ЦІХААКІЯ́НСКІЯ КАМПА́НІІ 1941—45, ваенныя дзеянні паміж узбр. сіламі Японіі і ЗША і іх саюзнікамі на Азіяцка-Ціхаакіянскім тэатры другой сусв. вайны 7.12.1941—2.9.1945 за захоп стратэг. ініцыятывы і панаванне ў гэтым рэгіёне ў 2-ю сусв. вайну 1939—45. Вылучаюцца 3 кампаніі: 1941—42, 1942—43, 1944—45.

Першая Ц.к. (7.12.1941 — ліст. 1942) пачалася нечаканым нападам яп. узбр. сіл на гал. амер. ваен.-марскую базу *Пёрл-Харбар* і інш. базы і аэрадромы ЗША і Вялікабрытаніі на Ціхім ак. Пазней яп. армія захапіла Малаю, Сінгапур, Філіпіны, Інданезію, Бірму (М'янму), в-аў Гуам і інш. тэр. (3800 тыс. км² з нас. 150 млн. чал.), выйшла на подступы да Аўстраліі і т.ч. дамаглася часовага панавання на Ціхім ак., аднак не дасягнула поўнай перамогі. 5—8.5.1942 у марской бітве ў Каралавым моры амер. ВМС дамагліся першага поспеху ў вайне. Пазней японцы пацярпелі буйное паражэнне каля атола *Мідуэй*, дзе 4—6.6.1942 адбылася бітва авіяносных злучэнняў. Апошняй значной падзеяй гэтай кампаніі сталі ўпартыя баі ў жн.—ліст. 1942 паміж амер. і яп. флатамі і арміямі ў р-не Саламонавых а-воў (Сава, Гуадалканал і інш.), у ходзе якіх японцы, нягледзячы на некат. тактычныя перамогі, страцілі стратэгічную ініцыятыву. Другая Ц.к. (снеж. 1942 — снеж. 1943) стала пераломнай у вайне на карысць саюзнікаў; выявілася перавага саюзнікаў у авіяцыі і сілах флоту, у т.л. ў авіяносцах. Летам 1943 саюзнікі пачалі наступальныя дзеянні і да канца года занялі а-вы Гілберта, Саламонавы (акрамя в-ва Бугенвіль), частку Новай Гвінеі і Новай Брытаніі, вызвалілі Алеуцкія а-вы і інш. Ваен. дзеянні ў Кітаі і Бірме насілі абмежаваны характар. У трэцюю Ц.к. (чэрв. 1944 — пач. вер. 1945) саюзнікі канчаткова авалодалі стратэг. ініцыятывай і пачалі выкананне спланаваных дэсантных аперацый з мэтай захопу астравоў і стварэння на іх плацдармаў для наступлення. У пач. 1944 амер. войскі авалодалі Маршалавымі і Марыянскімі а-вамі, ч. Каралінскіх а-воў, нанеслі паражэнне яп. флоту ў бітве за в-аў Лейтэ. Да канца 1944 саюзныя войскі вызвалілі ч. Паўн. Бірмы, пад іх кантролем апынуліся найважнейшыя марскія камунікацыі Японіі. У кастр. 1944 — ліп. 1945 саюзнікі занялі Філіпінскія а-вы, у студз.—ліп. 1945 — шэраг раёнаў Кітая і Бірмы, у чэрв. 1945 — в-аў Акінава і планавалі высадку на яп. астравы. 6 жн. 1945 амер. ВПС скінулі атамную бомбу на г. Хірасіма, 9 жн. — на г. Нагасакі (паводле меркавання некат. спецыялістаў, ваен. неабходнасці ў выкарыстанні ядз. зброі не было). Аднак Японія яшчэ мела буйныя сілы (каля 7,2 млн. чал., каля 100 караблёў і больш за 10 тыс. самалётаў). 9.8.1945 у вайну супраць Японіі ўступіў СССР (гл. *Савецка-японская вайна 1945*), узбр. сілы якога за кароткі тэрмін разграмілі *Квантунскую армію* (гл. *Маньчжурская аперацыя 1945*). 2.9.1945 Японія капітулявала. У ходзе Ц.к. адбылося 20 марскіх баёў і бітваў, каля 50 дэсантных аперацый, у час якіх асабліва выявіліся

лася важная роля авіяносцаў, падводнага флоту, авіяцыі; упершыню выкарыстаны радыёлакатары, напалм, рэактыўныя самалёты і інш., а ў апошнія дні — ядз. зброя. Страты Японіі склалі каля 1,85 млн. чал., да 200 караблёў, 131 падводная лодка; ЗША — 160 тыс. чал., 93 караблі, 56 падводных лодак.

Літ.: От Мюнхена до Токийского залива: Взгляд с Запада на трагич. страницы истории второй мировой войны: Перевод. М., 1992; Бунич И.Л. Второй Перл-Харбор; Лорд У. День позора. СПб., 1999; Хаттори Т. Япония в войне, 1941—1945: Пер. с яп. [2 изд.]. СПб., 2000; Яковлев Н.Н. От Перл-Харбора до капитуляции: (Война на Тихом океане, 1941—1945 гг.). М., 1965; Далл С. Боевой путь Императорского японского флота: Пер. с англ. Екатеринбург, 1997; Шерман Ф. Война на Тихом океане: Авианосцы в бою: Пер. с англ. М.; СПб., 2002; Крейг У. Падение Японии: Пер. с англ. Смоленск, 1999; Футида М., Окумия М. Сражение у атолла Мидуэй: Пер. с яп. СПб., 2001; Борковский М. Мидуэй, 1942: Пер. с пол. М., 2002; Иванов Ю.Г. Камикадзе: пилоты-смертники: Яп. самопожертвование во время войны на Тихом океане. Смоленск, 2001; Вольны А. Окинава, 1945: Пер. с пол. М., 2002; Морисон С.Э. Американский ВМФ во второй мировой войне: Восходящее солнце над Тихим океаном, дек. 1941 — апр. 1942: Пер. с англ. СПб., 2002; Агава Х. Адмирал Ямамото: Путь самурая, разгромившего Перл-Харбор, 1921—1943: Пер. с яп. М., 2003.

Ю.В.Бажэнаў, В.А.Юшкевіч.

ЦІХААКІЯНСКІЯ ЭСКАДРЫ 1904—05, злучэнні ВМФ Расіі, якія дзейнічалі на Д. Усходзе ў *руска-японскую вайну 1904—05*. 1-я Ц.э. (63 караблі, у т.л. 7 эскадраных браняносцаў і 10 крэйсераў; камандуючыя О.В.Старк, С.В.*Макараў*, В.К.Вітгефт, Р.М.Вірэн) складала гал. сілы рас. ВМФ на Ціхім ак.; базіравалася ў р-не Порт-Артура і ўдзельнічала ў *Порт-Артура абароне* 1904—05, дзе і загінула. 2-я Ц.э. адпраўлена ў кастр. 1904 з Балт. мора для ўзмацнення 1-й Ц.э. У лют. 1905 з той жа мэтай з Балт. мора рушыла 3-я Ц.э. пад камандаваннем М.І.Небагатава. Злучыўшыся ў крас. 1905 у Індыйскім ак., яны (33 караблі, у т.л. 10 эскадраных браняносцаў і 10 крэйсераў; каманд. З.П.Ражэственскі) удзельнічалі ў *Цусімскім баі 1905*, у ходзе якога разгромлены.

Літ.: Золотарев В.А., Козлов И.А. Русско-японская война 1904—1905 гг.: Борьба на море. М., 1990; Доценко В.Д. Морские битвы России, XVIII—XX вв. СПб., 1999; Куропаткин А.Н. Русско-японская война, 1904—1905: Итоги войны. СПб., 2002.

У.Я.Калаткоў.

ЦІХАВО́ЛЯ, вёска ў Дабравольскім с/с Свіслацкага р-на Гродзенскай вобл., каля р. Нараў. Цэнтр калгаса. За 27 км на ПдЗ ад Свіслачы, 117 км ад Гродна, 24 км ад чыг. ст. Свіслач. 235 ж., 90 двароў (2003). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

ЦІХАМІ́РАЎ (сапр. Міхайлаў) Васіль Дзмітрыевіч (29.3.1876, Масква — 20.6.1956), расійскі артыст балета, балетмайстар. Нар. арт. Рэспублікі (1934). Скончыў Пецярбургскае тэатр. вучылішча (1893). З 1893 артыст, адначасова ў 1913—35 балетмайстар, у 1925—30 заг. балетнай трупы Вял. т-ра ў Маскве. Яго творчасць адметная высокай тэхнікай, строгай манерай выканання; сцвярджаў мужны, гераічны стыль танца. Сярод партый: Базіль («Дон Кіхот» Л.Мінкуса), Жан дэ Брыен («Раймонда» А.Глазунова), Дэзірэ («Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага), Авас («Саламбо» А.Арэндса) і інш. Паставіў балет «Чырвоны мак» Р.Гліэра (1927, з Л.Лашчылініным).

ЦІХАМІ́РАЎ Віктар Васілевіч (н. 28.4.1958, Мінск), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1993). Скончыў БДУ (1980), дзе і працуе з 1984. З 1986 у НДІ ядз. праблем БДУ (з 1993 заг. лабараторыі). Навук. працы па квантавай электрадынаміцы, астрафізіцы, фізіцы элементарных часціц. Прадказаў (з У.Р.*Барышэўскім*) магнітатармазны механізм утварэння гама-квантамі электрон-пазітронных пар. Выявіў прынцыповую ролю эфекту радыяцыйнага ахаладжэння ў эксперыментах па вымярэнні энергет. страт электронаў высокіх энергій у крышталях. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1984. Дзярж. прэмія Беларусі 2002.

Тв.: Радиационные процессы магнитотормозного типа в кристаллах и сопровождающие их поляризационные явления (разам з У.Р.Барышэўскім) // Успехи физ. наук. 1989. Т. 159, № 3; Electron-spin precession in a plane electromagnetic wave // Phys. Rev. Lett. 2001. Vol. 87, вып. 18.

ЦІХАМІ́РАЎ Міхаіл Мікалаевіч (1.6.1893, Масква — 2.9.1965), расійскі гісторык. Акад. АН СССР (1953, чл.-кар. 1946) і Польскай АН (1959). Скончыў Маскоўскі ун-т (1917), з 1934 выкладаў у ім. З 1936 у Ін-це гісторыі АН СССР. У 1953—56 акадэмік-сакратар Аддз. гіст. навук АН СССР; першы старшыня Археагр. камісіі (з 1956), рэд. «Археографического ежегодника». Вывучаў пытанні класавай барацьбы ў Расіі ў эпоху феадалізму, гісторыю стараж.-рус. гарадоў і рус. культуры. У кн. «Старажытнарускія гарады» (2-е выд. 1956) удакладніў межы Полацкай зямлі; даследаваў гісторыю яе гарадоў —Полацка, Віцебска, Усвята, Мінска, Друцка, Заслаўя, Лагойска, Барысава. Апублікаваў шмат гіст. крыніц. Даследчык *Друцкага Евангелля*.

Тв.: Древняя Русь. М., 1975; Российское государство XV—XVII вв. М., 1973; Средневековая Москва. М., 1997.

ЦІХАМІ́РАЎ Сяргей Аляксандравіч (н. 28.7.1953, г.п. Правідзення Чукоцкай аўт. акругі Магаданскай вобл., Расія), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (2001). Скончыў БДУ (1975). З 1975 у Ін-це малекулярнай і атамнай фізікі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па дынаміцы фотафіз. і фотахім. працэсаў у складаных арган. малекулах. Устанавіў механізмы фотааднаўлення і фотадысацыяцыі для шэрагу арган. злучэнняў. Распрацаваў метад генерацыі фемтасекундных імпульсаў на аснове выкарыстання імпульсных лазераў.

Тв.: Быстропротекающие фотофизические и фотохимические релаксационные процессы в сложных органических молекулах (разам з Г.Б.Талстарожавым) // Журн. прикладной спектроскопии. 1998. Т. 65, № 5; Пассивная синхронизация мод фемтосекундного титан-сапфирового лазера при импульсной синхронной накачке ограниченным цугом пикосекундных импульсов (у сааўт.) // Квантовая электроника. 1999. Т. 28, № 3.

У.А.Ціхаміраў.

А.М.Ціханаў.

ЦІХАМІ́РАЎ Уладзімір Андрэевіч (11.7.1921, в. Запруддзе Уладзімірскай вобл., Расія — 6.6.1976), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Вял. Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Харкаўскае ваен. мед. вучылішча (1941), Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1945). У Вял. Айч. вайну на фронце з 1941. У баі пад Нясвіжам цяжка паранены, трапіў у палон. Уцёк з лагера смерці, стварыў і ўзначаліў у Чэрвеньскім р-не партыз. групу, якая перарасла ў атрад; з сак. 1943 камандзір 12-й кавалерыйскай партыз. брыгады імя Сталіна Мінскай вобл. Удзельнік вайны з Японіяй 1945. Пасля вайны на парт. рабоце. Яго імем названа вуліца ў г.п. Чырвоная Слабада Салігорскага р-на Мінскай вобл.

ЦІ́ХАН (у свеце Бялавін Васіль Іванавіч; 31.1.1865, с. Клін Пскоўскай вобл., Расія — 7.4.1925), расійскі царкоўны дзеяч. Канд. багаслоўя (1888). Скончыў Таропецкае духоўнае вучылішча, Пскоўскую семінарыю (1884), Пецярб. духоўную акадэмію (1888). У 1891 пастрыгся ў манахі, у 1897 узведзены ў сан епіскапа Люблінскага, вікарыя Холмска-Варшаўскай епархіі. У 1898—1907 узначальваў Алеуцкую і Паўн.-Амер. епархіі, у 1905 узведзены ў сан архіепіскапа. З 1907 кіраваў Яраслаўскай епархіяй. З 1913 архіепіскап літ. і віленскі. У чэрв. 1917 узведзены ў сан мітрапаліта, у ліст. 1917 абраны патрыярхам маскоўскім і ўсяе Расіі. З мэтай абараняць царкву, яе святыні і жыццё вернікаў напісаў шэраг зваротаў з заклікам спыніць беззаконне ў краіне. У 1922 дазволіў ужываць бел. мову ў набажэнствах у храмах Беларусі. У 1922—23 пад арыштам у выніку канфлікту з дзяржавай з-за

канфіскацыі царк. маёмасці. 16.6.1923 заявіў аб прызнанні сав. улады, вызвалены (у 1924 яго судовая справа спынена). У 1923 «абнаўленцкі» Памесны сабор пазбавіў Ц. сану і манаства, аднак ён не падпарадкаваўся гэтым, на яго думку, некананічным рашэнням. Здолеў захаваць асн. структуры Рус. правасл. царквы ад захопу абнаўленцамі. У 1988 кананізаваны.

Тв.: Послания. М., 1991.

Літ.: Вострышев М.И. Божий избранник. Крестный путь Святителя Тихона, Патриарха Московского и всея России. М., 1990; Солженицын А.И. Архипелаг ГУЛАГ. М., 1990. Т. 1. С. 247—252; Патрыярх Ціхан і БНР // Спадчына. 1997. № 2.

Н.К.Мазоўка.

ЦІХАНАЎ Аляксандр Іванавіч (н. 2.1.1947, с. Уйскае Чэлябінскай вобл., Расія), расійскі спартсмен (біятлон). Засл. майстар спорту СССР (1968). Чэмпіён X, XI, XII і XIII зімовых Алімп. гульняў (1968, г. Грэнобль, Францыя; 1972, г. Сапара, Японія; 1976, г. Інсбрук, Аўстрыя; 1980, г. Лейк-Плэсід, ЗША) у эстафеце 4×7,5 км. Чэмпіён свету (1969, 1970, 1973 — у гонцы на 20 км; 1976, 1977 — у гонцы на 10 км; 1969, 1970, 1971, 1973, 1974, 1977 — у эстафеце). Сярэбраны прызёр X Алімп. гульняў і чэмпіянатаў свету ў 1971, 1979 — у гонцы на 20 км, 1967, 1975 — у эстафеце. Бронз. прызёр чэмпіянатаў свету (1977 — у гонцы на 20 км; 1979 — у эстафеце). Чэмпіён СССР (1969, 1970, 1972, 1974, 1977 — у гонцы на 20 км; 1976, 1977 — у гонцы на 10 км; у 1970, 1971, 1972, 1974 — у эстафеце). Чэмпіён II зімовай Спартакіяды народаў СССР (1966, г. Свярдлоўск, Расія) у лыжных гонках на 5 і 10 км.

Літ.: Снегирев В. Лед и пламень // Твои чемпионы, Россия. М., 1973.

А.М.Петрыкаў.

ЦІХАНАЎ Андрэй Мікалаевіч (30.10.1906, г. Гагарын Смаленскай вобл., Расія — 8.10.1993), савецкі матэматык і геафізік. Акад. АН СССР (1966, чл.-кар. 1939). Двойчы Герой Сац. Працы (1953, 1986). Скончыў Маскоўскі ун-т (1927). У 1935—58 у Ін-це тэарэт. геафізікі, з 1953 у Ін-це прыкладной матэматыкі АН СССР (з 1979 дырэктар). Адначасова ў 1928—89 у Маскоўскім ун-це. Навук. працы па выліч. і прыкладной матэматыцы, інфарматыцы, матэм. фізіцы, геафізіцы, тапалогіі. Дзярж. прэміі СССР 1953, 1976, Ленінская прэмія 1966.

Тв.: Методы решения некорректных задач. 3 изд. М., 1986 (разам з В.Я.Арсеніным); Уравнения математической физики. 6 изд. М., 1999 (разам з А.А.Самарскім).

Літ.: А.Н.Тихонов // Успехи мат. наук. 1987. Т. 42, вып. 3.

ЦІХАНАЎ Віктар Пятровіч (н. 27.9.1955, в. Пукшына Віцебскага р-на), бел. мастак. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1978). Адрадзіў на Беларусі стараж. тэхніку разьбы на ляўкасе ў спалучэнні з жывапісам: «Дзед Сцяпан» (1976), «Успамін» (1977), «Слова аб Радзіме. Ф.Скарына», «Песня-ўспамін. М.Гусоўскі» (абодва 1980), «Свята ўраджаю», «Вянок жыцця. М.Багдановіч» (абодва 1981), трыптыхі «Сейбіты», «Вяртанне» (абодва 1982). Аўтар манум. работ: фрэска «Горад юнацтва» ў СШ № 67 (1981), вітражы «Прырода» ў Ін-це эксперым. батанікі Нац. АН Беларусі (1982), у Літ. музеі М.Багдановіча (1991) у Мінску; мазаіка «Лясная песня» ў кінатэатры «Радзіма» (1982), вітраж «Гарады Беларусі» ў будынку аўтавакзала (1984, усе ў сааўт.) у г. Маладзечна Мінскай вобл., размалёўка царквы святых Пятра і Паўла ў г. Семятычы (Польшча, 1987); іканастас Свята-Мікалаеўскай царквы ў Брэсце; кампазіцыя «Мір табе, зямля пад белымі крыламі» (1989). Жывапісныя творы вылучаюцца пуантылістычнай манерай выканання, экспрэсіўнасцю, гарманічнымі тонавымі суадносінамі: «Спадчына» (1978), «Мой родны кут. Я.Колас» (1982), «Ля вытокаў. В.Дунін-Марцінкевіч» (1983), «Сустрэча ў вёсцы Белае» (1984), «Восень на Браслаўшчыне», «Кастрычнік» (абодва 1997), «Цёплы дзень» (2001), цыкл з 21 карціны «Восень у Баварыі» (2000).

Л.Ф.Салавей.

ЦІХАНАЎ Вячаслаў Васілевіч (н. 8.2.1928, г. Паўлаўскі Пасад Маскоўскай вобл.), расійскі кінаакцёр. Нар. арт. СССР (1974). Герой Сац. Працы (1982). Скончыў Усесаюзны ін-т кінематаграфіі ў Маскве (1950). У 1950—57 у Тэатры-студыі кінаакцёра. Дэбютаваў у фільме «Маладая гвардыя» ў ролі Валодзі Асьмухіна (1948, паводле А.Фадзеева). Сярод вядомых вострахарактарных роляў

В.В.Ціханаў.

Мацвей Марозаў («Справа была ў Пянькове», 1958), Віктар Райскі («Надзвычайнае здарэнне», 1959). Стварыў шэраг лірычных, гераічных і рамант. вобразаў, раскрыў іх псіхал., эмацыянальную, інтэлектуальную сутнасць: Рукавічкін («Майскія зоркі», 1959), Панін («Мічман Панін», 1960), Аляксей («Аптымістычная трагедыя», 1963), Андрэй Балконскі («Вайна і мір», 1966—67), Мельнікаў («Дажывём да панядзелка», 1968, Дзярж. прэмія СССР 1970), Млынскі («Фронт без флангаў», 1975; «Фронт за лініяй фронту», 1978; «Фронт у тыле ворага», 1982), Іван Іванавіч («Белы Бім Чорнае вуха», 1977, Ленінская прэмія 1980) і інш. Найбуйнейшая работа Ц. — роля сав. разведчыка Ісаева (Шчырліца) у шматсерыйным тэлефільме «Семнаццаць імгненняў вясны» (1973, Дзярж. прэмія Расіі 1976). Зняўся таксама ў фільмах «Каханне з прывілеямі» (1991), «Стомленыя сонцам» (1994), тэлесерыяле «Зала чакання» (2001) і

В.П.Ціханаў. Кастрычнік. 1997.

В.Ціханаў у фільме «Белы Бім Чорнае вуха».

інш. За чытанне тэксту ў тэлефільме «Адраджэнне» Дзярж. прэмія Украіны 1980. Творчасці Ц. прысвечаны фільм «Прафесія — кінаакцёр» (1980).

Літ.: Медведев А. В.Тихонов. М., 1983.

ЦІХАНАЎ Іван Ціханавіч (22.2.1922, с. Галічча Вярхоўскага р-на Арлоўскай вобл., Расія — 11.5.1993), бел. мастак. Засл. дз. маст. Беларусі (1983). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1959). Працаваў у розных жанрах станковага жывапісу і ў манум.-дэкар. мастацтве. Яго творы вызначаюцца літ. характарам вобразнасці, публіцыстычнасцю, манументальнасцю і дэкаратыўнасцю жывапіснай мовы. Шмат твораў на ваен. тэму: «Сустрэча партызан з Чырвонай Арміяй» (1960), «Думы пра Радзіму» (1967), «Выхад з блакады» (1969, 1982), «Маці партызанская» (1979), «Заклік» (1982), «Прызыў» (1987), «1941. Мой пачатак» (1990), трыпціх «Край партызанскай славы» (1978). Аўтар партрэтаў Герояў Сав. Саюза Ц.П.Бумажкова, М.П.Шмырова, І.Д.Чарняхоўскага (усе 1981), П.М.Машэрава (1982), а таксама Я.Коласа (1993) і інш., карцін, прысвечаных мірнаму жыццю, пейзажаў. Выканаў манум. размалёўкі ў кінатэатры «Піянер» (з Я.Зайцавым) у Мінску, у Бел. НДІ аховы раслін у в. Прылукі Мінскага р-на (абедзве 1965), Палацы культуры ў в. Турэц Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл. (1967) і інш. *Л.Ф.Салавей.*

ЦІХАНАЎ Леанід Ніканоравіч (н. 19.2.1938, в. Малы Алонец Алонецкага р-на, Карэлія), бел. педагог і гісторык, дзярж. дзеяч. Замежны чл. Рас. акадэміі адукацыі (2001). Засл. дз. нав. Беларусі (1997). Д-р гіст. н. (1988), праф. (1989). Скончыў Гродзенскі ун-т (1960). З 1964 на камсамольскай і парт. рабоце. З 1978 прарэктар Мінскага ін-та замежных моў; з 1989 прарэктар, з 1993 рэктар Бел. пед. ун-та. З 1999 прэзідэнт Бел. акадэміі адукацыі. Даследуе развіццё і станаўленне бел. пед. навукі, праблемы ўдасканалення сістэмы вышэйшай адукацыі, абагульняе вопыт работы па маральным выхаванні моладзі. Чл. Савета Рэспублікі Нац. сходу Рэспублікі Беларусь, нам. старшыні пастаяннай камісіі па Нац. бяспецы і міжнар. справах (1996—2000).

Тв.: Коммунистическое воспитание учащейся молодежи. Мн., 1986; Творение личности педагога. Мн., 1998 (разам з Д.І.Вадзінскім, А.А.Грымацем). *В.Ф.Кушнер.*

ЦІХАНАЎ Мікалай Аляксандравіч (14.5.1905, г. Харкаў, Украіна — 1.6.1997), дзяржаўны дзеяч СССР. Двойчы Герой Сац. Працы (1975, 1982). Скончыў Днепрапятроўскі металург. ін-т (1930). З 1930 на інж.-тэхн. і адм.-гасп. рабоце, з 1950 у апараце Мін-ва чорнай металургіі СССР, з 1957 старшыня Днепрапятроўскага савета нар. гаспадаркі, з 1960 нам. старшыні Дзярж. навук.-эканам. савета СМ — міністр СССР, з 1963 — нам. старшыні Дзяржплана — міністр СССР. З 1965 нам., з 1976 1-ы нам. старшыні, у 1980—85 старшыня СМ СССР. Чл. ЦК (з 1966) і Палітбюро ЦК КПСС (1979—85).

ЦІХАНАЎ Мікалай Сямёнавіч (3.12.1896, С.-Пецярбург — 8.2.1979), рускі пісьменнік, грамадскі дзеяч. Герой Сац. Працы (1966). Нар. паэт Азербайджана (1974). Нар. паэт Узбекістана (1974). Скончыў Пецярбургскую гандл. школу (1911). З 1944 сакратар Саюза пісьменнікаў СССР. Друкаваўся з 1918. Першыя зб-кі вершаў — «Арда» і «Брага» (абодва 1922). Кнігі апавяд. «Ваенныя коні» (1927), «Вечны транзіт» (1934), аповесці «Ад мора да мора» (1925), «Вайна» (1931) адметныя назіральнасцю, маляўнічасцю і гумарам. Вершы, паэмы, нарысы, створаныя ва ўмовах ленінградскай блакады (паэма «Кіраў з намі», 1941, Дзярж. прэмія СССР 1942; зб. вершаў «Вогненны год», 1942), прасякнуты гераіка-патрыят. настроямі. Пасляваен. творы ўслаўляюць баявыя і прац. подзвігі, дружбу народаў, барацьбу за мір (цыклы вершаў «Грузінская вясна», 1948, Дзярж. прэмія СССР 1949; «Два патокі», 1951, Дзярж. прэмія СССР 1952; «На другім Сусветным кангрэсе міру», 1951). Аўтар кніг прозы «Двайная вясёлка» (1964), «Шэсць калон» (1968, Ленінская прэмія 1970), «Шматколерныя гадзіны» (1972). Ц. часта наведваў Беларусь, напісаў верш «У Мінску ў дні трыццацігоддзя Перамогі». На бел. мову асобныя яго творы пераклалі А.Куляшоў, П.Броўка, М.Танк, М.Аўрамчык, Р.Барадулін, С.Грахоўскі, М.Калачынскі, П.Макаль. Броўка прысвяціў яму арт. «...Скрозь ён вельмі неабходны...» (1976) і «Самы сардэчны сябар» (1979). Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» 1957.

М.С.Ціханаў.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—7. М., 1973—76; С марсианской жаждою творить. М., 1979; Стихотворения и поэмы. М., 1984; Бел. пер. — Ад мора да мора. Мн., 1931; Вайна. 2 выд. Мн., 1936; Адважны партызан. Мн., 1947; Апавяданні пра Пакістан. Мн., 1954; Спасціжэнне. Мн., 1978.

Літ.: Шошин В. Н.Тихонов: Очерк жизни и творчества. Л., 1981; Кенька М. Спасціжэнне паэзіі // Полымя. 1979. № 4. *М.В.Няхай, У.А.Паўлаў.*

ЦІХАНАЎ Павел Ільіч (27.2.1877, С.-Пецярбург — 23.3.1944), расійскі спя-

І.Ціханаў. Трыпціх «Край партызанскай славы». 1978.

вак (бас), педагог. Засл. дз. маст. Беларусі (1940). Скончыў Адэскую кансерваторыю (1919). З 1905 саліст оперных т-раў Пецярбурга, Кіева, Адэсы, з 1911 (з перапынкам) — Вял. т-ра ў Маскве. З 1928 выкладаў у Маскоўскай, у 1933—41 (з 1940 праф.) Бел. кансерваторыях. Яго творчай індывідуальнасці ўласцівы выдатная тэхніка валодання голасам, артыстызм. Сярод партый: Сусанін, Фарлаф («Іван Сусанін», «Руслан і Людміла» М.Глінкі), Млынар («Русалка» А.Даргамыжскага), Ландграф, Вотан («Тангейзер», «Валькірыя» Р.Вагнера), Мефістофель («Фауст» Ш.Гуно і «Мефістофель» А.Бойта), Санча Панса («Дон Кіхот» Ж.Маснэ) і інш. Сярод вучняў С.*Друкер*, Р.*Млодак*. *Л.П.Івашкоў.*

ЦІХАНО́ВІЧ Аляксандр Рыгоравіч (н. 13.7.1952, Мінск), бел. эстрадны спявак. Засл. арт. Беларусі (1991). Скончыў Бел. кансерваторыю (1982). З 1971 у Бел. філармоніі, саліст вак.-інстр. ансамбля «Верасы». З 1987 саліст-вакаліст Дзярж. аркестра сімф. і эстр. музыкі Беларусі. З 1988 стваральнік і кіраўнік (з жонкай Я.*Паплаўскай*) першага на Беларусі Т-ра песні і творчай студыі пры ім (у 2003 пераўтвораны ў прадзюсерскі цэнтр «Прафіартвідыён»). Адначасова з 2001 муз. кіраўнік бел. канала «Сталічнае тэлебачанне». Выступае (з Паплаўскай) у складзе эстр. вак. дуэта. Аўтар шматлікіх папулярных эстр. песень.

Літ.: Загародний Г. От «Верасов» — к Театру песни // Бел. думка. 1997. № 6.
Г.М.Загародні.

ЦІХАНО́ВІЧ Валянцін Мікалаевіч (29.8.1909, Вільнюс — 25.8.1978), бел. графік; адзін з пачынальнікаў *аніміліст-тычнага жанру* ў бел. графіцы. Скончыў Віцебскі маст. тэхнікум (1933). Творы вызначаюцца графічнай выразнасцю, эмацыянальнай вобразнасцю, тонкай стылізацыяй матываў, ураўнаважанасцю кампазіцыі. Стварыў ілюстрацыі да «Беларускіх народных казак» (1946), да кніг «Вераб'ёвы госці. Нашы прыяцелі» (з М.Гуцевым, 1945), «Звяры нашых лясоў» (1951), «Казка пра смелага вожыка» (1957) А.Якімовіча; «Нашы птушкі» А.Гурло (1947, 1952); «Мурашка-Палашка» З.Бядулі (1948, 1954); «Рыбы нашых рэк» (1952) і «Вада і вуда» (1967) А.Вялюгіна; «Конь і леў» М.Танка (1955), «Казка пра цара Зубра» В.Віткі (1960), «Родны край» В.Вольскага (1961, 1964), «Экзамен» Р.Барадуліна (1969). Аўтар графічных твораў «Вячэрні канцэрт», «Хтосьці ідзе» (абодва 1967), «Рэха далёкага стрэлу» (1968), экслібрысаў З.Азгура, М.Лужаніна і інш., сатыр. малюнкаў. *М.А.Гугнін.*

ЦІХАНО́ВІЧ Генрых Яўгенавіч (28.5.1937, Мінск — 29.12.2000), бел. мастак. Сын Я.М.*Ціхановіча*. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1963). У 1997—98 выкладаў у Бел. АМ. Зацікаўлены тэмамі гіст. і сац. характару, стварыў драм. свет вобразаў, уводзіў у кампазіцыю фантаст. пласт, ствараў метафарычную прастору, абапіраючыся на канкрэтныя падзеі: «Мірная раніца» (1965), «1905 год» (1966), «Хто з мячом да нас прыйдзе...» (1967), «Аблічча вайны» (1985), «Дзяды ў Курапатах» (1992), «Не спі, Радзіма!» (1998), «Толькі б не было вайны», «Памяці сына» (абодва 2000). Аўтар партрэтаў «Ля сіняй бухты. М.Багдановіч» (1985), «Францыск Скарына» (1986), «Мой дзед Галубок» (1992), «Я.Купала. Сорак першы», «А.Міцкевіч. Вязень» (абодва 1998) і інш.; лірычных пейзажаў «За акном майстэрні» (1985), «Браслаўскі краявід» (1990), «Няміга сніцца мне» (1995) і інш.; серый акварэлей «Нарачанская сюіта» (1972—75), «КамАЗ будуецца» (1974), «Азёры Карэліі» (1980), «Незабыўны Байкал» (1981); афортаў «Навапалацкі нафтаперапрацоўчы камбінат» (1975), «Метрабудаўцы Мінска» (1982—85), экслібрысаў. *Л.Ф.Салавей.*

В.**Ціхановіч**. Ілюстрацыя да кнігі «Беларускія народныя казкі». 1946.

ЦІХАНО́ВІЧ Канстанцін Георгіевіч (н. 8.7.1929, пас. Таміліна Ухтомскага р-на Маскоўскай вобл.), бел. графік. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1959). У 1963—84 маст. рэдактар час. «Беларусь». Ілюстраваў творы бел. і замежных аўтараў у бел. перыяд друку. Афарміў кнігі «Кухаронак» В.Сіманавай (1961), «Навальніца спее ў цішыні» А.Шашкова (1973), «Віця Малееў у школе і дома» М.Носава (1979), «Яраслаўна» В.Вярбы (1986) і інш. Выканаў станковыя кампазіцыі «Пасуць авечак» (1957), «Кактусы», «Дом І з'езда РСДРП» (абедзве 1967), «Ад'езд Я.Коласа ў семінарыю» (1972), «Космас» (1975), «Падсвілле. Ціха ў былым партызанскім краі» (1984), трыпціхі «Памяць» (1987), «Хатынь» (1995). Аўтар мемар. медалёў, значкоў, экслібрысаў, дыяфільма «Францыск Скарына» (1994) і інш. Творы вылучаюцца кампазіцыйнай раўнавагай, акцэнтаваным кантрастам чорных і белых плям, экспрэсіўным штрыхом.

ЦІХАНО́ВІЧ Міхаіл Рыгоравіч (н. 17.9.1920, в. Дубаўляны Мінскага р-на), поўны кавалер ордэна Славы. У Вял. Айч. вайну з чэрв. 1941 на Паўд., Зах., Варонежскім, Цэнтр., 1-м Укр. франтах. Камандзір сапёрнага аддзялення ст. сяржант Ц. вызначыўся ў баях за вызваленне Украіны, Польшчы і Чэхаславакіі: 4.7.1944 з групай сапёраў разміраваў 2 мінныя палі і зрабіў праход у драцяной загародзе праціўніка; 6.11.1944 пад варожым агнём з групай сапёраў зрабіў праход для разведкі, зняў 25 процітанк. мін; 30.1.1945 у час наступлення выявіў мінnае поле, паранены, абясшкодзіў 14 процітанк. мін. Да 1983 у нар. гаспадарцы.

ЦІХАНО́ВІЧ Яўген Мікалаевіч (н. 25.11.1911, г.п. Джусалы Кзыл-Ардзінскай вобл., Казахстан), бел. мастак. Скончыў Віцебскі маст. тэхнікум (1932). Значнае месца ў творчасці займае гіст. тэматыка, партрэтная галерэя дзеячаў бел. культуры. Рэалістычнасцю вобразаў, сюжэтаў, выразнасцю задумы вызначаюцца жывапісныя палотны «У рабства» (1944), «Апавяданне байца» (1946), «Дапамога Масквы партызанам» (1947), «Партызаны ў разведцы» (1948), «Гуляюць дублёры» (1954), «Партызаны ў за-



Г.**Ціхановіч**. Ля сіняй бухты. М.Багдановіч. 1985.

садзе» (1958), «Узнагарода Я.Коласа ордэнам Леніна» (1982); партрэтныя кампазіцыі «Р.К.Арджанікідзе ў разведцы пад Барысавам» (1936), «Я.Купала і З.Бядуля ў рэдакцыі газеты «Наша ніва» ў 1914 годзе» (1951, з І.Давідовічам) і інш.; партрэты мастакоў А.Глебава (1946), В.Ціхановіча (1983), А.Пятрухны (1984), нар. артыста Беларусі У.Галубка (1968, 1972). Аўтар графічных кампазіцый: «Пераправа цераз раку Белую», «Палонныя белапалякі» (абедзве 1940), «Дэкрэт аб зямлі» (1963) і інш.; партрэтаў А.Пашкевіч (Цёткі, 1976), Ф.Скарыны, Ф.Багушэвіча (абодва 1977), Я.Купалы, Я.Коласа (абодва 1978) і інш.; трыпціха «Кастусь Міцкевіч у студэнцкія гады» (1959), пейзажаў, ілюстрацый да кніг, больш за 400 экслібрысаў.

Л.Ф.Салавей.

Я.Ціхановіч. У.Галубок. 1972.

ЦІХАНРА́ВАЎ Міхаіл Клаўдзіевіч (29.7.1900, г. Уладзімір, Расія — 4.3.1974), савецкі вучоны ў галіне ракетабудавання і касманаўтыкі. Чл.-кар. Міжнар. акадэміі астранаўтыкі (1968). Д-р тэхн. н. (1958). Герой Сац. Працы (1961). Засл. дз. нав. і тэхн. Расіі (1970). Скончыў Ваенна-паветр. акадэмію імя Жукоўскага (1925). Працаваў на прадпрыемствах авіяц. прам-сці. З 1932 у Групе вывучэння рэактыўнага руху. З 1934 у Рэактыўным НДІ (нач. аддзела). Адначасова з 1960 у Маскоўскім авіяц. ін-це. Навук. працы па даследаванні вадкасных рухавікоў, праектаванні вышынных ракет. Кіраваў стварэннем першай сав. ракеты на гібрыдным паліве (1933), адзін з гал. стваральнікаў першых у свеце міжкантынент. ракет-носьбітаў, ШСЗ, пілатуемых касм. караблёў, аўтам. міжпланетных станцый. Ленінская прэмія 1957.

Тв.: Ракетная техника. М., 1935.

Літ.: Пионеры и создатели ракетной техники. М., 1975.

У.С.Ларыёнаў.

ЦІХАЎ Гаўрыіл Андрыянавіч (1.5.1875, г. Смалявічы Мінскай вобл. — 25.1.1960), савецкі астраном і астрафізік, заснавальнік астрабатанікі. Чл.-кар. АН СССР (1927), Акад. АН Казахстана (1946). Ганаровы акад. Нац. АН Беларусі (1959). Засл. дз. нав. Казахстана (1946). Скончыў Маскоўскі (1897) і Парыжскі (1901) ун-ты. Пабудаваў хатнюю абсерваторыю ў Смалявічах (1894). У 1906—41 у Пулкаўскай абсерваторыі. Адначасова ў 1919—31 у Ленінградскім ун-це, у 1919—49 у Прыродазнаўча-навук. ін-це. З 1941 у Алма-Аце, з 1947 заг. сектара астрабатанікі АН Казахстана. Навук. працы па астрафізіцы, астраметрыі, атм. оптыцы, аэрафотаздымцы, астрабатаніцы. Адкрыў эфект запазнення фаз у зацьменных зорак у кароткахвалевай вобласці спектра (1908, эфект Ц. — Нордмана). Упершыню выкарыстаў у планетных назіраннях каляровыя святлафільтры, атрымаў першыя фатаграфіі Марса ў розных абласцях спектра (1909). Устанавіў (1914), што Зямля пры назіранні з космасу павінна мець блакітнаваты колер. Ацаніў колеравую тэмпературу сонечнай кароны (1936). Сканструяваў шэраг фотаметрычных прыбораў. Выдаў каталогі колераў 17 874 зорак (1937, 1951). Прэмія Парыжскай АН (1909). Яго імем названы кратэры на Марсе і адваротным баку Месяца, астэроід.

Тв.: Основные труды. Т. 1—5. Алма-Ата, 1954—60; Шестьдесят лет у телескопа. М., 1959.

Літ.: Еремеева А.И. Выдающиеся астрономы мира: Рекоменд. указ. М., 1966; Суслов А.К. Г.А.Тихов, 1875—1960. Л., 1980.

М.М.Касцюковіч.

ЦІХАХО́ДКІ (Tardigrada), тып беспазваночных жывёл. Вядомы з мелавога перыяду. 2 атр., каля 300 відаў. Жывуць у прэсных вадаёмах, вільготных глебах, імхах і інш. На Беларусі найб. адзначаецца Ц. вялікая (Macrobiotus hufelandi).

Даўж. 0,1—1,2 мм. У будове спалучаюць рысы *кольчатых чарвей* і *членістаногіх*. Галава не адасоблена, 4 пары нячленістых шышкападобных ног з 2—9 кіпцюркамі на канцы. Рухаюцца павольна (адсюль назва). Покрыва з *кутыкулай*. Маюць 2 простыя вочкі. Ротавыя органы — пара вострых штылетаў. Стрававальны тракт — прамая трубка ўздоўж цела. Дыхаюць праз скуру. Раздзельнаполыя. Развіццё прамое, з лінькамі. Кормяцца сокамі водарасцей, імхоў, дробных жывёл. Наземныя Ц. здольныя да *анабіёзу*.

С.Л.Максімава.

ЦІХВІН, горад у Ленінградскай вобл. Расіі, на р. Ціхвінка (ч. *Ціхвінскай воднай сістэмы*). Вядомы з 1383 як Прадцеканскі Ціхвінскі пагост. З 1773 горад. 67,1 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Прам-сць: машынабудаванне (с.-г. і чыг. тэхніка), дрэваапр. і лесахім. (каніфоль, смала, шкіпінар, хвойны экстракт); харч., лёгкая, выт-сць буд. матэрыялаў. Філіял Паўн.-Зах. політэхн. ін-та. Арх. помнікі на тэр. Вял. Успенскага манастыра (цяпер Гіст.-мемарыяльны і арх.-маст. музей) — Успенскі сабор (1505—15), цэрквы Трапезная (Пакроўская, 1581) і Спаская (1593), Увядзенская вежа (1687) і інш. Дом-музей М.А.Рымскага-Корсакава.

М.К.Ціханраваў. Г.А.Ціхаў.

ЦІХВІНСКАЯ ВО́ДНАЯ СІСТЭ́МА, адзін з водных шляхоў Расіі, што злучае р. Волга з Балтыйскім морам. Адкрыта ў 1811. Пачынаецца каля *Рыбінскага вадасховішча*, праходзіць па рэках Чагадошча, Гарун, Сомінка, Ціхвінскім злучальным канале, рэках Ціхвінка, Сясь. Прыладажскім абводным канале, р. Нява. Састарэла, выкарыстоўваецца для мясц. перавозак. Ніжняя яе ч. ўваходзіць у *Волга-Балтыйскі водны шлях*.

ЦІХЕ́ВІЧ Валянцін Паўлавіч (н. 2.8.1949, г. Бабруйск Магілёўскай вобл.), бел. флейтыст. Засл. арт. Беларусі (1991). Скончыў Бел. кансерваторыю (1973, кл. С.Сізко), у 1981—82 выкладаў у ёй. З 1973 саліст Дзярж. акад. сімф. аркестра Беларусі, адначасова ў 1984—91 — квінтэта духавых інструментаў Бел. філармоніі. У 1999—2002 выкладчык Мінскага муз. вучылішча імя Глінкі. Вядзе канцэртную дзейнасць.

ЦІХІ АКІЯ́Н, Вялікі акіян, найбуйнейшы басейн Сусв. акіяна. Абмежаваны мацерыкамі Еўразія і Аўстралія на З, Паўн. і Паўд. Амерыка на У, Антарктыда на Пд. Пл. з морамі 178,62 млн. км^2, аб'ём вады 710,36 млн. км^3 (53% аб'ёму вады Сусв. акіяна). Сярэдняя глыб. 3980 м, найб. — 10 920 (*Марыянскі жолаб*).

Берагавая лінія складаная, пераважаюць фіёрдавы і абразійны тыпы берагоў. У трапічных шыротах на З берагі ў асн. каралавыя месцамі з бар'ернымі рыфамі. Берагі Антарктыды ўтвораны пераважна шэльфавымі ледавікамі. Да бас. Ц.а. належаць моры: паўзам-

Ціхаходка вялікая.

кнёныя — Берынгава, Ахоцкае, Японскае і Унутр. Японскае, Усх.-Кітайскае, Жоўтае і Паўд.-Кітайскае, а таксама міжастраўныя, аб'яднаныя назвай Аўстрала-Азіяцкае міжземнае мора; ускраінныя — Каралавае і Тасманава, каля берагоў Антарктыды — Амундсена, Белінсгаўзена і Роса; буйныя зал. Аляска, Каліфарнійскі, Панамскі (гл. адпаведныя артыкулы).

Астравы. Паводле колькасці астравоў (каля 10 тыс., пл. каля 3,6 млн. км^2) Ц.а. займае 1-е месца сярод акіянаў. Мацерыковыя астравы размешчаны пераважна на зах. ускраіне Ц.а. — Сахалін, Японскія, Тайвань, усе буйныя а-вы Малайскага архіпелага, а-вы Новай Зеландыі і інш.; на ўсх. — большасць астравоў каля Паўн. і Паўд. Амерыкі. Вулканічныя астравы трапляюцца на ўсёй акваторыі акіяна — б.ч. Алеуцкіх, Курыльскіх, Рукю, Гавайскіх, Самоа, Маркізскіх, Тубуаі, Галапагас, Хуан-Фернандэс, Чатэм і інш. Біягенныя (каралавыя) астравы размешчаны пераважна ў экватарыяльна-трапічных шыротах — Маршалавы, Гілберта, Тувалу, Такелау, Кука, Лайн, Фенікс, Туамоту і інш.; узнятыя рыфы — Мінаміторы (Маркус), Уэйк, Науру, Хаўленд і інш.; атолы — Тонграва, Джонстан, Капінгамарангі і інш.

Будова дна. Вылучаюцца: падводныя ўскраіны мацерыкоў (10,2%; пашыраны ва ўскраінных морах Заходняга сектара, вобласці Малайскага архіпелага, каля паўн. і ўсх. ўзбярэжжаў Аўстраліі), мацерыковы схіл (3%), вобласці пераходных зон (13,3%), ложа акіяна (65,5%), сярэдзінныя акіянічныя хрыбты (11% ад пл. акіяна). Рэльеф дна Ц.а. характарызуецца найб. (параўнальна з інш. акіянамі) расчлянёнасцю і слабым развіццём *шэльфа* (1,7% ад пл. акіяна). На ПнЗ, З і ПнУ шэльф уяўляе сабой абразійна-акумулятыўную раўніну, ускладненую рачнымі далінамі і рэліктавымі формамі ледавіковага рэльефу. На З шыр. шэльфа да 800 км, глыб. вонкавага краю 150—500 м. Мацерыковы схіл вузкі і стромы (10—30°). Каля берагоў Аўстраліі мноства каралавых пабудоў, на вонкавым краі акаймаваны *Вялікім бар'ерным рыфам*. На У шэльф вузкі (некалькі дзесяткаў кіламетраў), абмежаваны ўступам на глыб. 1000—1500 м (Каліфарнійскі бардэрленд). Мацерыковы схіл круты, парэзаны шматлікімі каньёнамі, конусы вынасу якіх утвараюць нахіленую раўніну мацерыковага падножжа. Вылучаецца глыба кары кантынент. тыпу палеазойскага ўзросту — Кэмпбел (Новазеландскае плато). Мацерыковая ўскраіна Антарктыды вызначаецца пашырэннем ледавіковых і айсбергавых адкладаў. Мацерыковы схіл (глыб. 500 м) шырокі, парэзаны каньёнамі. Па паўн. і зах. перыферыі Ц.а. ў пераходнай зоне ад п-ва Аляска да а-воў Новая Зеландыя цягнецца сістэма катлавін ускраінных мораў (глыб. 3000—7000 м), астраўных дуг і спалучаных з імі акіянічных жалабоў (якім адпавядаюць макс. глыбіні Ц.а.) — Алеуцкі (7855 м), Курыла-Камчацкі (9783 м), Ідзу-Огасавара (Ідзу-Банінскі; 9810 м), Марыянскі (10 920 м), Філіпінскі (10 265 м) і інш. (гл. адпаведныя артыкулы).

Сістэма сярэдзінна-акіянічных хрыбтоў — адзіная структура, даўж. больш за 7000 км. Падзяляецца на *Паўднёва-Ціхаакіянскае падняцце* (*хрыбет*), шыр. 750 км і *Усходне-Ціхаакіянскае падняцце*, шыр. да 2000 км. Характарызуецца скляпеннепадобнай будовай, значнай шырынёй, вял. колькасцю трансформных разломаў, зямной карой рыфтагеннага тыпу. Сярэдзінна-акіянічныя хрыбты тэктанічна актыўныя. Скорасць рассоўвання хрыбтоў у асн. перавышае 5 см за год, зрэдку 16—18 см. На адлегласці каля 2 км ад гал. хрыбта дно разбіта сістэмай скідаў і грабенаў. На аддаленні 10—12 км тэктанічная актыўнасць амаль адсутнічае.

Ложа акіяна сістэмай падняццяў падзелена на шэраг катлавін: Паўн.-Заходнюю (6965 м), Паўн.-Усходнюю (6850 м), Філіпінскую (7759 м), Зах.-Марыянскую (7534 м), Усх.-Марыянскую (6150 м), Зах.-Каралінскую (5798 м), Усх.-Каралінскую (7208 м), Белінсгаўзена (5120 м), Паўднёвую (6600 м), Чылійскую (5021 м) і інш. Падняцці полігенетычныя: акіянічныя валы, глыбавыя горы, вулканічныя хрыбты, ускраінныя валы і хрыбты, асобныя горы (гаіёты) і інш. Для асобных катлавін характэрны шыротныя разломы (даўж. 4000—5000 м). Ц.а. — найб. стараж. з акіянаў, развіваецца з пратэразою, у мезазоі быў суперакіянам, пасля чаго ў выніку дрэйфу літасферных пліт пастаянна скарачаецца. Катлавінам і падняццям ложа Ц.а. адпавядае кара акіянічнага тыпу, дзе «базальтавы» слой сярэдняй магутнасцю да 7000 м; асадкавы слой складзены з ніжняга, больш шчыльнага асадкавага або вулканагеннага слоя (магутнасць ад соцень да тысяч метраў, у некат. ранёнах адсутнічае) і верхняга, больш рыхлага (1000—2000 м).

Донныя адклады тэрыгеннага паходжання (абломкавыя і гліністыя) займаюць 10% плошчы Ц.а., пераважна на падводнай ускраіне мацерыкоў; тэрыгенна-айсбергавыя ўтвараюць паласу шыр. да 1000 м каля берагоў Антарктыды. У пелагіялі акіяна на Пд ад экватара да 60° паўд. ш. пашыраны карбанатныя фарамініферавыя адклады (каля 38% пл. акіяна). Птэраподавыя адклады ў Каралавым м. У экватарыяльна-трапічным поясе на шэльфе і мацерыковым схіле — каралавыя ўтварэнні (1% плошчы). Вылучаюцца 3 паясы біягенных (крамяністых) асадкаў (10% плошчы): паўн. і паўд. (субантарктычны) дыятомавых ілоў і экватарыяльны радыялярыевых ілоў. Ракушачныя намнажэнні пашыраны на ўсіх шэльфах, акрамя антарктычнага. У раёнах сучаснага і антрапагенавага вулканізму сярод асадкавых адкладаў значная прымесь вулканагенных. На глыбінях больш за 4500—5000 м у малапрадукцыйных зонах вял. пл. дна (35%) укрыты чырв. глыбакаводнымі глінамі. Асадкі сярэдзінна-акіянічных хрыбтоў і іх схілаў абагачаны аксідамі і гідраксідамі жалеза і марганцу, што выносяцца ў прыдонныя воды высокатэмпературнымі руданоснымі растворамі.

Карысныя выкапні: нафта і газ на шэльфе (ЗША, Перу, Расія, Кітай, Эквадор, Інданезія); вял. палі жалеза-марганцавых канкрэцый (пл. 16 млн. км^2) у адкрытым акіяне, на схілах вулканічных астравоў і падводных гарах; россыпныя радовішчы касітэрыту (Інданезія), рутылу, торыю, цыркону (Аўстралія, Інданезія), золата і плаціны (узбярэжжа Аляскі, Каліфорніі, Чылі), тытана-магнетытавай руды (Японія, Інданезія, Расія, ЗША); радовішчы фасфарытаў (на шэльфах Каліфорніі і а-воў Новая Зеландыя); каменны вугаль на шэльфе Японіі, Аўстраліі, Новай Зеландыі і Паўд. Амерыкі. У межах сярэдзінна-акіянічных *рыфтаў* буйныя радовішчы сульфідных руд (цынк, медзь, свінец, рэдкія металы). На многіх мелкаводных участках шэльфа эксплуатуюцца радовішчы неметал. карысных выкапняў.

Клімат. Большая частка Ц.а. размешчана ў субэкватарыяльным, трапічным, субтрапічным і ўмераным кліматычных паясах, меншая ў экватарыяльным і субарктычным. У паўн.-зах. частцы акіяна мусонная цыркуляцыя атмасферы. Ва ўмераных шыротах зах. вятры, у трапічных і субтрапічных на Пн і Пд адпаведна паўн.-ўсх. і паўд.-ўсх. пасаты. На З трапічнай зоны з чэрв. па ліст. тайфуны (27—50 за год). Цыркуляцыя атмасферы над Ц.а. вызначаецца 4 асн. абласцямі атм. ціску: Алеуцкім мінімумам, Паўн.-Ціхаакіянскім, Паўд.-Ціхаакіянскім і Антарктычным максімумамі.

Гідралагічны рэжым. Паверхневыя цячэнні абумоўлены атм. цыркуляцыяй. На Пн ад 40° паўн. ш. субпалярны цыкланічны кругаварот, што складаецца з Аляскінскага, Алеуцкага, Камчацкага, Курыльскага і Паўн.-Ціхаакіянскага цячэнняў. На Пд ад гэтай сістэмы — субтрапічны антыцыклянальны кругаварот, утвораны Паўн. Пасатным, Курасіо, Паўн.-Ціхаакіянскім і Каліфарнійскім цячэннямі. У нізкіх шыротах Паўн. Пасатнае, Міжпасатнае (Экватарыяльнае) супрацьцячэнне і Паўд. Пасатнае ўтвараюць 2 вузкія трапічныя цыклянальныя кругавароты. У Паўд. паўшар'і таксама назіраецца субтрапічны антыцыклянальны кругаварот, што складаецца з Паўд. Пасатнага, Усх.-Аўстралійскага, Зах. Вятроў і Перуанскага цячэння. Цячэнне Зах. Вятроў сумесна з Антарктычным цячэннем усх. кірунку ўтварае паўд. субпалярны цыклянічны кругаварот. У паверхневых водах з З на У супрацьцячэнне Кромвела звязана з буйнамаштабным глыбінным пераносам вады. У паўд.-зах. частцы акіяна існуе цёплае цячэнне Эль-Ніньё, якое перыядычна мяняе свой напрамак і т-ру; назва мяняецца на Ла-Нінья. У Ц.а. самыя высокія (да 34 м) ветравыя хвалі. Сярэднегадавая т-ра вады на паверхні 19,1 °С. Найб. салёнасць 35,5‰ і 36,5‰ адзначана адпаведна ў паўн. і паўд. субтрапічных шыротах. Каля экватара памяншаецца да 34,5‰ і менш, у паўн. умераных шыротах зніжаецца да 30—31‰, у паўд. высокіх шыротах — да 33,5‰. Шчыльн. вады на паверхні раўнамерна павялічваецца ад экватара (1021 кг/м^3) да высокіх шырот (1027 кг/м^3).

Прылівы ў адкрытай ч. акіяна на Пн і ПдУ няправільныя паўсутачныя (да 12 м у зал. Кука; 2,6 м каля берагоў Чылі). У паўд. ч. акіяна — правільныя паўсутачныя (7,2 м каля берагоў Аўстраліі), у экватарыяльнай вобласці — сутачныя і няправільныя сутачныя (2,5 м каля Новай Гвінеі, 1 м каля Саламонавых а-воў). Макс. прыліў 13,2 м (Пенжынская губа Ахоцкага м.). Лёдаўтварэнне адбываецца ў паўн.-зах. морах (Берынгава, Ахоцкае, Японскае, Жоўтае), на Пн зал. Аляска і каля берагоў Антарктыды. Зімой і вясной лёд выносіцца Курыльскім цячэннем у паўн.-зах. частку Ц.а. Ад берагоў Антарктыды льды і айсбергі выносяцца ў люг. да 61—64° паўд. ш., у жн. да 70° паўд. ш., у канцы лета да 40—48° паўд. ш. У выніку землетрасенняў або падводных вывяржэнняў вулканаў узнікаюць *цунамі* (ПнУ акіяна).

Флора і фаўна багатая і разнастайная. Фауна Ц.а. ўключае каля 100 тыс. відаў, фітапланктон каля 380 відаў. У зоне шэльфа прадстаўлены бурыя, фукусавыя, ламінарыевыя водарасці, малюскі, чэрві, ракападобныя, ігласкурыя і інш. арганізмы. У мелкаводнай трапічнай зоне шмат каралаў (400 відаў), утвараюць каралавыя рыфы. Фауна рыб уключае не менш як 2000 відаў у трапічных шыротах і да 800 відаў ва ўмераных. У паўн. умераных і паўд. высокіх шыротах

ЦІХІ АКІЯН
Сярэдняя мяжа плывучых ільдоў у перыяд найменшага распаўсюджвання
Сярэдняя мяжа плывучых ільдоў у перыяд найбольшага распаўсюджвання
Цёплыя і халодныя цячэнні для лета паўночнага паўшар'я
Лінія перамены дат
Заўвага. Адзнакі вышынь на сушы і глыбінь на моры дадзены паводле Атласа свету (М., ВКА „Картаграфія", 1999), таму магчымы разыходжанні з артыкуламі, якія прайшлі раней.
МАШТАБ 1:75 000 000
ШКАЛА ГЛЫБІНЬ І ВЫШЫНЬ У МЕТРАХ
глыбей 10000 8000 6000 5000 4000 2000 200 0 200 500 1000 2000 4000 6000 вышэй
100° 120° 140° 160°
20° 0° 20° 40° 60°
Экватар
Паўднёвы тропік
АЎСТРАЛІЯ
ТАСМАНІЯ
Мальдзівы
Каломба
Сінгапур
Джакарта
Дарвін
Перт
Сідней
Мельбурн
Адэлаіда
Аўкленд
Уэлінгтан
Кука
Норфалк
Новая Каледонія
Сува
Фіджы
Тонга
Самоа
Гуам
Токіо
Пусан
Шанхай
Пекін
Харбін
Хабараўск
Уладзівасток
Камандорскія а-вы
Курыльскія а-вы
Сахалін
Японскія а-вы
Філіпінскія а-вы
Малайскі а-аў
Бенгальскі
Андаманскае
Малакскі
Суматра
Ява
Тымор
Новая Гвінея
Новая Зеландыя
Бісмарка
Салямонавы а-вы
Бугенвіль
Новыя Гебрыды
Фіджы
Тонга
Самоа
Гуам
Філіпінскія а-вы
Японскія а-вы
Курыльскія а-вы
Камандорскія а-вы
Сахалін
Берынга
Аляскінскі
Алеуцкія а-вы
Берынгава
Чукоцкае
Усходнесібірскае
Лаптевых
Карскае
Белае
Баранцава
Норвежскае
Грэнландскае
Ісландыя
Фарэрскія а-вы
Шатландыя
Ірландыя
Англія
Еўропа
Скандынавія
Балтыйскае
Паўночнае
Міжземнае
Чорнае
Каспійскае
Аральскае
Індыя
Кітай
Японія
Карэя
Манголія
Казахстан
Расія
Амерыка
Паўночная
Заходняя
Цэнтральная
Усходняя
Мелянезійская
Заходнія Марыянская катлавіна
Усходнія Марыянская катлавіна
Заходнія Каралінская катлавіна
Усходнія Каралінская катлавіна
Катлавіна Тасмана
Катлавіна Фіджы
Катлавіна Уэлінгтан
Катлавіна Кука
Плато Кэмпбел
Плато Чатам
Плато Новая Зеландыя
Плато Антыпод
Плато Кергелен
Плато Крозе
Плато Агульных Вятроў
Плато Антарктычнае
Плато Паўднёвае
Плато Балені
Плато Скота
Плато Маўрыкій
Плато Маскарэн
Плато Мадагаскар
Плато Зямля Уілкса
Плато Паўднёва-Ціхаакіянскае
Плато Паўднёва-Ціхаакіянскае ўзвышша
Плато Паўднёва-Ціхаакіянскае ўзвышша
Плато Паўднёва-Ціхаакіянскае ўзвышша

ПАЎНОЧНАЯ АМЕРЫКА
ПАЎДНЁВАЯ АМЕРЫКА
Паўночны тропік
Паўднёвы палярны круг
Берынгава пратока
Мексіканскі заліў
Гудзонава затока
Карыбскае мора
Мексіканскае нагор'е
Цэнтральнаамерыканскі хрыбет
Бразільскае пласкагор'е
Перуанская катлавіна
Чылійскае ўзвышша
Фалклендскія (Мальвінскія) а-вы
Вогненная Зямля
Панамскі канал
Джордж-таун
Порт-Лаўрэнс
Порт-Робінсан
Ванкувер
Сент-Пол
Атава
Галіфакс
Нью-Ёрк
Сент-Луіс
Вашынгтон
Лос-Анджэлес
Сан-Дыега
Эль-Паса
Х'юстан
Новы Арлеан
Маямі
Гавана
Мехіка
Гватэмала
Тэгусігальпа
Манагуа
Сан-Хасэ
Панама
Каракас
Санта Фе-да-Багата
Кіта
г. Чымбараса
Ла-Пас
Арыка
Асунсьён
Буэнас-Айрэс
Пуэрта-Монт
Пунта-Арэнас
Порт-Стэнлі
Мыс Горн
Мыс Горн
Мыс Горн

шматлікія млекакормячыя: кашалот, некалькі відаў кітоў-паласацікаў, марскія коцікі, лахтак, морж і сівуч (на Пн), а таксама крабы, крэветкі, вустрыцы, галаваногія малюскі і інш. Шмат эндэмікаў.

Гаспадарчае выкарыстанне. На Ц.а. прыпадае 50% сусв. здабычы рыбы (мінтай, селядзец, ціхаакіянскія ласосі, трасковыя, марскія акуні, тунцы, скумбрыя, сайра і інш.) і інш. морапрадуктаў. У паўн.-зах. частцы Ц.а. сканцэнтраваны гал. запасы ласосевых рыб. Сярод нярыбных аб'ектаў пераважаюць кальмары, крэветкі, мідыі, марскія грабеньчыкі і інш. Ц.а. дае каля 90% сусв. здабычы водарасцей. Прадукцыя марыкультуры Ц.а. дасягае $^3/_4$ яе сусв. велічыні.

У многіх рэгіёнах Ц.а. вядзецца здабыча карысных выкапняў (пераважна ў межах шэльфа). Эксплуатуецца 70% разведаных (больш за 120) радовішчаў нафты і газу. Гал. раёны нафтагазаздабычы: паўд. ч. Каліфарнійскага шэльфа, зал. Кука (Аляска), зал. Гуаякіль (Эквадор), шэльф Японіі, зал. Бохайвань (КНР), прал. Баса, Малайскі архіпелаг, Паўн. в-аў Новай Зеландыі, Бруней, Тайланд, Малайзія, Інданезія, Перу. Здабыча каменнага вугалю вядзецца каля берагоў Японіі.

Ц.а. займае 2-е месца ў свеце па аб'ёме марскіх перавозак. Найб. важныя трансп. шляхі звязваюць парты ЗША і Канады з партамі Японіі, ЗША і Аўстраліі. Вял. значэнне мае Панамскі канал. Пераважаюць экспартна-імпартныя перавозкі: сыравінныя грузы (нафта і нафтапрадукты, каменны вугаль, руды чорных і каляровых металаў, драўніна), збожжа, рыба, прамысл. тавары. Асн. маршруты авіяліній праз Гавайскія а-вы ў Японію, Філіпіны, Сідней, Лос-Анджэлес. Па дне акіяна пракладзены тэлеграфныя кабелі. На берагах размяшчаюцца спецыялізаваныя і універсальныя парты, найб. буйныя з іх (па аб'ёме грузаабароту): Уладзівасток, Находка, Петрапаўлаўск-Камчацкі (Расія); Вансан (КНДР); Пусан (Паўд. Карэя); Цяньцзінь, Шанхай, Гуанчжоў, Сянган (КНР); Іакагама, Кавасакі, Тыба, Кобе, Осака, Токіо (Японія); Хайфон, Хашымін (СРВ); Сінгапур (Сінгапур); Сідней, Мельбурн (Аўстралія); Уэлінгтан (Новая Зеландыя); Ванкувер (Канада); Лос-Анджэлес, Сан-Францыска, Окленд, Сіэтл, Портленд (ЗША); Кальяо (Перу); Уаска (Чылі); Сурабая, Палембанг (Інданезія) і інш.

Літ.: Богданов Д.В. Океаны и моря накануне XXI в. М., 1991; Тихий океан. М., 1982; Залогин Б.С., Кузьминский К.С. Мировой океан. М., 2001. *А.Я.Яротаў.*

ЦІХІНІЧЫ, вёска ў Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл., на р. Дабрыца. Цэнтр сельсавета і камунальнага с.-г. унітарнага прадпрыемства. За 20 км на ПнЗ ад горада і чыг. ст. Рагачоў, 141 км ад Гомеля. 1216 ж., 549 двароў (2003). Вінзавод, участак раённага жыл.-камунальнага прадпрыемства. Сярэдняя школа, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Свята-Міхайлаўская царква (1997). Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

Вядомы ў канцы 16 ст. як мястэчка ў Рагачоўскім пав. ВКЛ. З 1793 у Рас. імперыі, цэнтр воласці Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ. У 1886 у Ц. 297 ж., 60 двароў, царква, капліца, вадзяны млын, 10 крам, штогадовы кірмаш. З 20.8.1924 у Рагачоўскім р-не Бабруйскай акругі, з 20.2.1938 у Гомельскай вобл. У 1941 — 835 ж., 135 двароў. У Вял. Айч. вайну ў ліст. 1941 ням. фашысты загубілі ў Ц. 44 жыхары, у 1944 спалілі вёску і загубілі 32 жыхары.

ЦІХІ́НСКІ Язэп (?—1921), бел. лексікограф. Жыў у маёнтку Прусін на Магілёўшчыне. Аўтар 16-томнага «Беларуска-польска-рускага слоўніка» (не выдадзены), складанню якога прысвяціў амаль 40 гадоў жыцця. Рукапіс слоўніка (636 аўтарскіх арк.) уключае больш за 150 тыс. агульных слоў, уласных асабовых імён, назваў дзяржаў, гарадоў, мясцовасцей, а таксама пашыраныя запазычанні («алігархія», «альманах» і інш.). Пры перадачы слоў вытрыманы важнейшыя фанет. асаблівасці бел. мовы (аканне, яканне, дзеканне, цеканне), адлюстравана афіксальнае словаўтварэнне («але́й — але́яць — але́як — але́яны — але́явы — але́йня — але́йніца — паале́яць» і інш.). Працу Ц. высока ацаніў М.Федароўскі. Частка рукапісу слоўніка (7308 старонак) зберагаецца ў б-цы АН Літвы. У 1909—12 друкаваў допісы ў газ. «Наша ніва» пад псеўд. Язэп Бурачок. *М.Р.Суднік.*

ЦІХІ́НЯ Валерый Гур'евіч (н. 1.10.1940, г.п. Капаткевічы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл.), бел. правазнавец, дзярж. дзеяч, педагог. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1994), д-р юрыд. н. (1985), праф. (1987). Засл. юрыст Беларусі (1990). Скончыў БДУ (1963). З 1963 у Мінскім НДІ судовых экспертыз, з 1965 у БДУ. З 1966 у органах пракуратуры (з 1972 пракурор Ленінскага р-на Мінска). З 1974 у БДУ (з 1979 дэкан ф-та, з 1984 прарэктар). З 1989 міністр юстыцыі Беларусі. З 1990 сакратар ЦК КПБ. З 1991 заг. кафедры Акадэміі кіравання пры СМ Беларусі. З 1993 нам. старшыні Вышэйшай атэстацыйнай камісіі. З 1994 нам. старшыні, з 1995 старшыня Канстытуцыйнага суда Беларусі. Дэп. Вярх. Савета Рэспублікі Беларусь у 1990—94. З 1996 прэзідэнт Бел. фонду прававога супрацоўніцтва. З 1999 заг. кафедры Бел. эканам. ун-та. З 2003 заг. кафедры Мінскага ін-та кіравання. Навук. працы па тэарэт. праблемах грамадз. працэсуальнага і канстытуцыйнага права, актуальных пытаннях фарміравання ў Беларусі дэмакр. прававой дзяржавы, сямейнага, міжнар., прыватнага права. Удзельнічаў у распрацоўцы праектаў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994, Грамадз. кодэкса і Кодэкса законаў аб працы Рэспублікі Беларусь, інш. заканад. актаў. Аўтар падручнікаў па правазнаўстве для ВНУ, юрыд. даведнікаў і слоўнікаў.

Тв.: Гражданский процесс БССР. Ч. 1—4. Мн., 1979—82 (у сааўт.); Теоретические проблемы применения данных криминалистики в гражданском судопроизводстве. Мн., 1983; Тернистый путь к правовому государству. Мн., 1995; Конституционное право: Энцикл. словарь. Мн., 1996 (разам з М.І.Пастуховым); Конституция Республики Беларусь: Науч.-правовой коммент. Мн., 1996 (у сааўт.); Правовое положение иностранцев в Республике Беларусь. Мн., 1998; Международное частное право. 4 изд. Мн., 2001; Гражданский процесс. Т. 1—2. Мн., 2002—03; Гражданское процессуальное право Республики Беларусь. [Т. 1—2]. Мн., 2002. *М.П.Савік.*

В.Г.Ціхіня.

К.Г.Ціхоўскі.

ЦІХМЕ́НЕЎ Мікалай Сяргеевіч (27.7.1885, Масква — 14.1.1963), удзельнік рэв. руху на Беларусі і Зах. фронце, дыпламат. Скончыў Маскоўскі ун-т (1909). З 1914 палкавы ўрач на Зах. фронце. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 чл. армейскага к-та, нам. старшыні ВРК 2-й арміі, адзін са стваральнікаў бальшавіцкай арг-цыі. Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 чл. дэлегацыі па падпісанні дагавора аб перамір'і на Зах. фронце ў ліст. 1917 у мяст. Солы Ашмянскага пав. У 1919—20 чл. рэўваенсавета 15-й арміі Зах. фронту. У кастр. 1920 чл. дэлегацыі па падпісанні мірнага дагавора з Фінляндыяй. З 1922 у Наркамаце асветы РСФСР. У 1925—30 і 1934—37 на дыпламат. рабоце ў Францыі, Японіі, Даніі. З 1938 у сістэме аховы здароўя. Чл. ВЦВК у 1925—31. Аўтар успамінаў у кн. «У барацьбе за Кастрычнік у Беларусі і на Заходнім фронце» (1957).

ЦІХО́ЎСКІ (Цыхоўскі) Казімір Генрыхавіч (псеўд. Граф, Высоцкі, Ясінскі; 7.12.1887, г. Астровец-Свентакшыскі, Польшча — 22.6.1940), дзеяч польскага і міжнар. рабочага руху, парт. і дзярж. дзеяч Літвы і Беларусі. Вучыўся ў Льежскім політэхн. ін-це (1907—09) і Парыжскім ун-це (1910—13). У рэв. руху з 1902. Чл. СДКПіЛ з 1907. Удзельнік Кастр. рэвалюцыі 1917 у Петраградзе. З ліст. 1917 нам. камісара па польскіх справах у Наркамнацы РСФСР. Са снеж. 1918 чл. ЦК КП Літвы, з 20.2.1919 старшыня ЦВК Літ. ССР, з 27.2.1919 — Літ.-Бел. ССР; з крас. 1919 чл. Савета абароны

Літ.-Бел. ССР; адначасова ў маі—ліп. 1919 (у Мінску) нарком земляробства Літбела, з 24.7.1919 старшыня Мінскага Савета. З вер. 1919 у ЦК КП(б)ЛіБ і палітаддзеле Зах. фронту. З крас. 1921 у Польшчы. Адзін з арганізатараў Кампартыі Усх. Галіцыі (з 1923 КПЗУ), чл. яе ЦК. У 1925—29 чл. ЦК Кампартыі Польшчы (да 1927 чл. Палітбюро ЦК). У 1928—29 сакратар камуніст. фракцыі сейма. З 1932 у СССР, у Выканкоме Камінтэрна. У 1936—37 адзін з арганізатараў інтэрнац. брыгад у Іспаніі. Рэпрэсіраваны, расстраляны. Рэабілітаваны пасля 1956.

ЦІ́ШАЧКІН Мікалай Пятровіч (14.3.1938, г. Віцебск — 30.4.1993), бел. акцёр. Засл. арт. Беларусі (1976). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1959). Працаваў у Бел. т-ры імя Я.Коласа. Выконваў востраха-рактарныя ролі, якія вызначаліся выразным пластычным малюнкам. Сярод роляў бел. рэпертуару: Самахвальскі («Несцерка» В.Вольскага), Тата («Зацюканы апостал» А.Макаёнка), Віктар Пятрэня («Вайна пад стрэхамі» паводле А.Адамовіча), Жора Сыч, Навіцкі («Укралі кодэкс», «Трывога» А.Петрашкевіча). Інш. ролі: Іпаліт («Мінулася кату масленіца» А.Астроўскага), Іван Пятровіч («Прыніжаныя і зняважаныя» паводле Ф.Дастаеўскага), Еліходаў («Вішнёвы сад» А.Чэхава), Румін, Міхаіл («Дачнікі», «Зыкавы» М.Горкага), Гела («Не трывожся, мама!» паводле Н.Думбадзе), Ламбардзі, Маскатэль, Дэ ля Катары («Слуга двух гаспадароў», «Каханне не жарты», «Забаўны выпадак» К.Гальдоні), Броннікаў («Пяць раманса́ў у старым доме» У.Аро), Леанідзік («Мой бедны Марат» А.Арбузава), Чарнявы («Энергічныя людзі» В.Шукшына), Навасельцаў («Таварышы па службе» Э.Брагінскага і Э.Разанава) і інш.

Т.Дз.Арлова.

ЦІ́ШКАЎСКАЕ РАДО́ВІШЧА НА́ФТЫ. У Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл., каля в. Цішкаўка. Адкрыта ў 1972, распрацоўваецца з 1976. Прымеркавана да ўзнятага крыла Рэчыцка-Вішанскай зоны падняццяў на Пн Прыпяцкага прагіну, паміж Рэчыцкім і Асташкавіцкім радовішчамі. Прамысл. нафтаноснасць звязана з дэвонскімі міжсалявымі (ялецкімі), падсалявымі карбанатнымі (варонежскімі, сямілуцкімі, саргаеўскімі), тэрыгеннымі (ланскімі, старасаскольскімі) і верхнепратэразойскімі адкладамі. Глыб. залягання нафтаносных гарызонтаў падсалявога комплексу 3396—3533 м. Паклады пластавыя, тэктанічна экраніраваныя. Пароды-калектары — поравыя пясчанікі і трэшчына-кавернава-поравыя даламіты. Нафта падсалявых тэрыгенных і карбанатных адкладаў лёгкая, маласярністая, парафіністая. Распрацоўваюцца паклады варонежскага і сямілуцкага гарызонтаў. Паклады нафты ў міжсалявых адкладах (на У структуры) прымеркаваны да ялецкага і петрыкаўскага гарызонтаў. Пароды-калектары — поравыя вапнякі і даламіты. Нафта сярэдняй шчыльнасці. Паклад не распрацоўваецца.

Я.Г.Грыбік.

ЦІШКЕ́ВІЧ Іван Станіслававіч (1.1.1919, г. Хойнікі Гомельскай вобл. — 2001), бел. правазнавец. Д-р юрыд. н. (1970), праф. (1971). Засл. юрыст Беларусі (1971). Скончыў Мінскі юрыд. ін-т (1948). З 1949 у БДУ, у 1963—88 заг. кафедры. Працы па пытаннях крымінальнага права. Адзін з аўтараў і рэдактар «Крымінальнага права БССР» (т. 1—2, 1978).

Тв.: Приготовление и покушение по советскому уголовному праву. М., 1958; Условия и пределы необходимой обороны. М., 1969; Вопросы уголовного права в практике Верховного Суда БССР. [Т. 1—2]. Мн., 1973—76 (разам з І.І.Гарэлікам); Применение уголовного законодательства в судебной практике БССР. Мн., 1982 (з ім жа).

ЦІШКО́ЎСКІ Уладзімір Рыгоравіч (н. 22.6.1933, г. Магілёў), бел. вучоны ў галіне эндакрыналогіі, кардыялогіі і рэўматалогіі. Д-р мед. н. (1984), праф. (1985). Скончыў Бел. мед. ін-т (1963), дзе працаваў у 1963—65. З 1968 у Гродзенскім мед. ун-це (з 1993 заг. кафедры). Асн. навук. працы па праблемах эндакрыналогіі.

Тв.: Кислородная емкость крови у больных сахарным диабетом (у сааўт.) // Междунар. научн. конференция: Сб. материалов. Гродно, 1998. Ч. 1; Биомеханические и технологические особенности ортопедической коррекции при «диабетической стопе» (у сааўт.) // III Sympozjum inżynieria ortopedyczna i protetyczna. Białystok, 2001.

ЦІШО́ЎКА, вёска ў Магілёўскім р-не, каля аўтадарогі Магілёў—Бабруйск. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 5 км на ПдЗ ад Магілёва, 3 км ад чыг. ст. Буйнічы. 1084 ж., 443 двары (2003). 2 лесапіларамы. Сярэдняя і мастацтваў школы, клуб, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЦІ́ШЧАНКА Віктар Елісеевіч (н. 15.3.1927, в. Бярозкі Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1968), праф. (1971). Засл. дз. нав. Башкірыі (1970). Засл. дз. нав. Расіі (1971). Скончыў Львоўскі політэхн. ін-т (1951) і Маскоўскі нафтавы ін-т (1956). З 1951 на гасп.-эканам. рабоце ў Сібіры. З 1960 заг. кафедры Уфімскага нафтавага ін-та. У 1983—95 заг. кафедры Гомельскага ун-та. Навук. працы па праблемах арганізацыі, планавання і павышэння эфектыўнасці вытв-сці ў нафтавай, газавай і нафтаперапр. прам-сці.

Тв.: Повышение производительности труда в добыче нефти. М., 1976 (разам з Э.А.Зайнетдзінавым); НОТ и техническое нормирование на нефтяных предприятиях. 2 изд. М., 1986 (у сааўт.); Программно-целевое планирование линейного строительства. Мн., 1987 (разам з В.Р.Карпавым); Организация и планирование нефтегазоразведочных работ с основами АСУ. 4 изд. М., 1990.

ЦІ́ШЧАНКА Вячаслаў Яўгенавіч (19.8.1861, С.-Пецярбург — 25.2.1941), расійскі хімік. Акад. АН СССР (1935, чл.-кар. 1928). Скончыў Пецярб. ун-т (1884), дзе і працаваў (з 1907 праф.). З 1934 дырэктар Ін-та прыкладной хіміі. Навук. працы па хіміі прыродных злучэнняў. Адкрыў рэакцыю кандэнсацыі альдэгідаў у складаныя эфіры (рэакцыя Ц.—Каніцара). Распрацаваў спосабы прамысл. сінтэзу камфоры са шкіпінару, рэцэптуру новага высакаякаснага хім. шкла, атрымання чыстых хім. рэактываў, ёду з марскіх водарасцей. Дзярж. прэмія СССР 1941.

Тв.: Сборник избранных трудов. Л., 1934.

І.К.**Цішчанка**.

І.Р.**Цішчанка**.

ЦІ́ШЧАНКА Іван Кірылавіч (22.5.1930, в. Улукі Слаўгарадскага р-на Магілёўскай вобл. — 22.2.2001), бел. фалькларыст, літаратуразнавец, крытык. Канд. філал. н. (1968), праф. (1992). Скончыў БДУ (1956). З 1957 працаваў у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, з 1992 заг. кафедры ў Бел. ун-це культуры. Даследаваў праблемы гісторыі бел. фальклярыстыкі, жанры фальклору, міфалогію. Складальнік кніг «Беларускія частушкі» (1960, з К.П.Кабашнікавым), «Жартоўныя песні» (1974), «Песні пра каханне» (1978), «Сямейна-бытавыя песні» (1984), «Паэзія барацьбы» (1985), «Сацыяльна-бытавыя песні» (1987, з В.І.Скіданам), «Прыпеўкі» (1989) са зводу «Беларуская народная творчасць». Сааўтар манаграфій «Беларуская народная вусна-паэтычная творчасць» (1967), «Беларуская народна-паэтычная творчасць» (1979), «Беларуская фальклярыстыка» (1989) і інш. Аўтар літ.-знаўчых артыкулаў, рэцэнзій на творы бел., рус., укр. і польскіх пісьменнікаў, сцэнарыяў дакумент. фільмаў «Бывайце здаровы» (1981), «Песня на ўсё жыццё» (1986, з А.Лісам) і «Вяртанне Міхася Забэйды» (1990, з П.Марчуком). Дзярж. прэмія Беларусі 1986.

Тв.: Беларуская частушка: Пытанні генезісу жанру. Мн., 1971; Жыццё песні. Мн., 1984; Да народных вытокаў: Збіранне і вывучэнне бел. фальклору ў 50—60-я гг. XIX ст. Мн., 1986.

Я.К.Адамовіч.

ЦІ́ШЧАНКА Іван Рыгоравіч (25.2.1912, в. Улукі Слаўгарадскага р-на Магілёўскай вобл. — 8.7.1987), бел. хімік-арга-

нік. Чл.-кар. АН Беларусі (з 1974), д-р хім. н. (1967), праф. (1968). Скончыў БДУ (1938), дзе і працаваў (з 1963 заг. кафедры, адначасова ў 1953—65 дэкан ф-та). Навук. працы па даследаванні рэакцыйнай здольнасці арган. рэчываў. Распрацаваў новыя метады сінтэзу ацыклічных, карба- і гетэрацыклічных злучэнняў (з атамамі кісларoду O, азоту N, серы S), з некалькімі функцыян. групамі.

Тв.: Гетерогенные реакции и реакционная способность. Мн., 1964 (у сааўт.); Органическая химия в Белгосуниверситете // Вестн. БГУ. Сер. 2. 1971. № 3.

ЦІШЧАНКА Мікалай Апанасавіч (24.2.1925, с. Чарноцічы Сосніцкага р-на Чарнігаўскай вобл., Украіна — 8.1.1996), бел. вучоны ў галіне анкалогіі. Д-р мед. н. (1971), праф. (1973). Скончыў Адэскі мед. ін-т (1952). З 1959 у Бел. ін-це ўдасканалення ўрачоў (з 1973 праф., у 1982—92 заг. кафедры). Асн. працы па дыягностыцы і лячэнні пухлін страўнікава-кішачнага тракту, падстраўнікавай залозы, жоўцевых шляхоў. Распрацаваў і ўкараніў метады радыкальных аперацый пры метастазах рака на шыі.

Тв.: Клинико-рентгенологические методы диагностики опухолей в панкреато-дуоденальной зоне // Здравоохранение Белоруссии. 1964. № 12; Клиника и дифференциальная диагностика механических желтух. Мн., 1973.

ЦІШЧАНКА Яўген Міхайлавіч (н. 7.12.1960, г. Гродна), бел. вучоны ў галіне медыцыны. Д-р мед. н. (2002). Скончыў Гродзенскі мед. ін-т (1983), дзе і працуе (з 2002 заг. кафедры). Віцэ-старшыня Бел. навук. т-ва гісторыкаў, медыцыны і фармацыі (з 1995). Навук. працы па гісторыі медыцыны і ахове здароўя Беларусі 19—20 ст.

Тв.: История здравоохранения Беларуси в XX в. Гродно, 2001.

1

Цмен: 1 — пясчаны; 2 — прыкветкавы.

ЦМЕН (Helichrysum), род кветкавых раслін сям. складанакветных. Каля 500 відаў. Пашыраны ў Еўразіі, Афрыцы і Аўстраліі. На Беларусі 1 від — Ц. пясчаны, або бяссмертнік (H. arenarium), нар. назвы залатушнік, змяёўнік лясны, грымотнік, кацялапкі, нячуйвецер, сухазелле. Трапляецца ў хваёвых лясах, на пясчанай глебе, каля дарог. Інтрадукаваны Ц. прыкветкавы (H. bracteatum) — адна з лепшых раслін для зімовых букетаў (гл. *Сухацветы*).

Адна- і шматгадовыя травяністыя расліны і паўкусты, часта з густым лямцавым апушэннем. Лісце суцэльнае, чаргаванае. Кветкавыя кошыкі ў шчыльных складаных шчытках, зрэдку адзіночныя. Абгортка кошыка з многіх радоў ярка афарбаваных плевачных бліскучых лісцікаў. Плод — сямянка. Суквецці Ц. пясчанага маюць дубільныя рэчывы, вітаміны C, K, карацін, эфірны алей. Лек., інсектыцыдныя, фарбавальныя і дэкар. расліны.

В.М.Прохараў.

«ЦМЕНЬ», адна з назваў метэарыта *«Жмень»*.

ЦМОК, з м е й, персанаж усх.-слав. чарадзейных казак; многагаловая (3 і больш галоў) крыважэрная істота, якая здольна прымаць чалавечае аблічча і пануе ў падземным ці падводным царствах. Узнікненне вобраза Ц. звязана з культам агню, з абрадамі ахвярапрынашэнняў бажаствам урадлівасці і інш. У працэсе гіст. эвалюцыі ў міфах, заклінаннях і казках ператварыўся ў варожы народу вобраз крылатай пачвары, якая выкрадае жанчын, бярэ паборы людзьмі і робіць зло. Ц. — гал. вораг героя-волата (напр., *Кацігарошка* і інш.), які змагаецца з ім, перамагае і вызваляе царскую дачку (сястру). Для ўсх.-слав. казак, у т.л. бел., характэрна маляўнічасць і гратэскавая сац. завостранасць вобраза Ц.

Літ.: Новиков Н.В. Образы восточнославянской волшебной сказки. Л., 1974; Бараг Л.Г. Сюжет о змееборстве на мосту в сказках восточнославянских и других народов

2

// Славянский и балканский фольклор. М., 1981. *Л.Р.Бараг.*

ЦНА, рака ў Ляхавіцкім, Ганцавіцкім і Лунінецкім р-нах Брэсцкай вобл., левы прыток р. Прыпяць (бас. р. Дняпро). Даўж. 126 км. Пл. вадазбору 1130 км^2. Пачынаецца на Капыльскай градзе ме-

Рака **Цна** ў Лунінецкім раёне.

ліярац. каналам за 500 м на У ад в. Гайнінец Ляхавіцкага р-на, вусце за 4 км на Пд ад в. Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на. Цячэ ў межах Прыпяцкага Палесся. Даліна да в. Велута і ніжэй за в. Кажан-Гарадок невыразная, схілы пакатыя, на астатнім працягу трапецападобная, шыр. ад 100—500 м да 1—2 км. Схілы ўмерана стромкія, выш. 4—5 м, слабапарэзаныя. Пойма двухбаковая, у Лунінецкім р-не каля в. Купаўцы, Бараўцы, Вічын аднабаковая, шыр. 0,5—1 км, пераважна забалочаная, перасечаная старымі рэчышчамі і асушальнымі канавамі. У разводдзе затапляецца да 15 сут на глыб. 0,3—1,6 м. Рэчышча ад вытоку на працягу 54 км каналізаванае, у ніжнім цячэнні моцнавілістае, шыр. каля 10 м. Берагі стромкія і абрывістыя. Асн. прыток — канал Карыцінскі (справа). Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Замярзае ў канцы снеж., крыгалом у сярэдзіне красавіка. Веснавое разводдзе пачынаецца ў сярэдзіне сак. і цягнецца ў сярэднім 76 дзён. Найвыш. ўзровень над меланню 3,1 м. Веснавы крыгаход 11 сут. Сярэднегадавы расход вады ў вусці 7,23 м^3/с. На веснавы перыяд прыпадае 65% гадавога сцёку. Выкарыстоўваецца як водапрыёмнік меліярац. сістэм. На рацэ г. Ганцавічы. *А.А.Макарэвіч.*

ЦНА, Ч ы р в о н а я р э ч к а, рака ў Лагойскім, Барысаўскім і Смалявіцкім р-нах Мінскай вобл., левы прыток р. Гайна (бас. р. Дняпро). Даўж. 66 км. Пл. вадазбору 609 км^2. Пачынаецца за 1 км на ПнУ ад в. Літвічы Лагойскага р-на, вусце на ўсх. ускраіне в. Сутокі Смалявіцкага р-на. Асн. прытокі: Чар-

ніца і Лавоша (справа). Цячэ па паўн.-ўсх. частцы Мінскага ўзвышша. Даліна трапецападобная, месцамі не выражана, шыр. да 3,5 км. Схілы спадзістыя, выш. 10—20 м, ад 3 м у вярхоўі да 30 м у ніжнім цячэнні. Пойма пераважна двухбаковая (шыр. 300—600 м). Рэчышча каналізаванае, акрамя ўчасткаў на працягу 14 км ад вытоку і 2 км перад вусцем. Рака замярзае ў канцы ліст., крыгалом у сярэдзіне сакавіка. Прымае сцёк з меліярацыйных каналаў.

ЦНА, балота ў Барысаўскім і Лагойскім р-нах Мінскай вобл., у вадазборы р. Цна (бас. р. Гайна). Нізіннага тыпу. Пл. 6,5 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 6,1 тыс. га. Глыб. торфу да 5,9 м, сярэдняя 2,4 м. Торф здабываюць на паліва. Балота асушана адкрытай сеткай і выкарыстоўваецца пад ворыва і сенажаць.

ЦНА, вёска ў Мінскім р-не, на р. Цна, каля *Цнянскага вадасховішча*, каля паўн.-ўсх. ускраіны Мінска. Цэнтр сельсавета. 838 ж., 254 двары (2003). Бібліятэка.

ЦНО, возера ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Друйка (цячэ праз возера), за 1,5 км на У ад г. Браслаў. Уваходзіць у *Браслаўскую групу азёр*. Пл. 0,57 км^2, даўж. 1,1 км, найб. шыр. 850 м, найб. глыб. 2,9 м, даўж. берагавой лініі 3,7 км. Пл. вадазбору 452 км^2. Катлавіна падпруднага тыпу, лопасцевай формы. Схілы катлавіны выш. 6—10 м, у ніжняй ч. разараныя, у верхняй занятыя сухадольным лугам і лесам. Берагі нізкія, забалочаныя і сплавінныя. Дно плоскае, сапрапелістае, пры ўпадзенні Друйкі — заіленыя пяскі. У межах Ц. востраў пл. 0,011 км^2. Моцна зарастае. Па возеры праходзіць турысцкі маршрут.

ЦНЯ́НСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА, галаўное вадасховішча *Сляпянскай воднай сістэмы*, на паўн. ускраіне Мінска. Створана ў 1981. Пл. 0,94 км^2, даўж. 1,5 км, найб. шыр. 1,4 км, найб. глыб. 7,5 м, аб'ём вады 2,1 млн. м^3. Наліўное: напаўняецца па вадаводзе з вадасховішча *Дразды*. Катлавіна — прыродная ўпадзіна. Дно пясчанае. Берагі пясчаныя, зах. і паўн.-зах. пад лесам. Востраў пл. 0,6 км^2. Даўж. земляной плаціны 1,1 км. Ваганні ўзроўню вады на працягу года 0,5 м. Моцна праточнае. Выкарыстоўваецца для водазабеспячэння і воднага добраўпарадкавання Мінска. Месца адпачынку (даўж. пляжаў каля 2 км).

ЦО́КАЛЬ (ад італьян. zoccolo), ніжняя частка вонкавай сцяны будынка, збудавання, помніка, што ляжыць на фундаменце. Вядомы са старажытнасці ў манум. грамадскіх і культавых будынках. Узнік як умацаванне (патаўшчэнне) ніжняй ч. сцяны, калоны, пілястры, партала і інш. Часта апрацоўваецца *рустыкай*, профілямі, дэкар. абліцоўкай. У ордэрнай архітэктуры звычайна меў выгляд п'едэстала з 3-часткавым чляненнем.

ЦО́КАЛЬ у электра- і радыётэхніцы, канструктыўная частка электроннай ці інш. лямпы, прызначаная для ўстаноўкі яе ў патрон (або лямпавую панэль) і гальванічнага злучэння яе ўнутр. элементаў са знешнім эл. ланцугом.



Цокаль.

ЦО́МПЕЛЬ Павел Аксанавіч (5.8.1933, с. Вербка Ляцічаўскага р-на Хмяльніцкай вобл., Украіна — 12.2.1997), бел. скульптар. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1965). Працаваў у манум. і станковай скульптуры. Найб. значныя манум. творы: Мемарыяльны комплекс у гонар воінаў 1-га Бел. фронту і партызан у в. Сычкава Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл. (1968), помнікі «Партызанская зямля» ў в. Іканы Барысаўскага р-на Мінскай вобл. (1965), сав. патрыётам, што загублены ням. фашыстамі ў 1941, у калгасе «Дружба» Свіслацкага р-на Гродзенскай вобл. (1966, з А.Веліксонавым; усе з арх. Ю.Казаковым). Аўтар станковых работ: «Партызан-сейбіт», «Праметэй» (абедзве 1967), «Рэквіем» (1969), «Е.Міровіч» (1970), «Асілак» (1986), кампазіцыі «Вялікая Айчынная вайна» (1975). *Б.А.Крэпак.*

ЦОРН (Zorn) Андэрс (18.2.1860, Мора, Швецыя — 22.8.1920), шведскі мастак. Вучыўся ў маст.-прамысл. школе (1875—77) і АМ (1877—81) у Стакгольме. Зазнаў уплыў імпрэсіянізму. Пачынаў як акварэліст, з 1880-х г. працаваў у алейным жывапісе. Творы вылучаюцца свабоднай і віртуознай, амаль эскізнай манерай выканання, смелымі эфектамі асвятлення, лепкай формы шырокім мазком: «Танец у Іванаву ноч», «Тост» (абодва 1897), «Дзяўчаты ў лазні» (1906), шматлікія ню ў пленэры і інш. Індывідуальнасць мадэлі, асаблівасці мімікі і жэстаў адлюстраваны ў партрэтах А.А.Каклен (1889), С.Мамантава (1896); аўтапартрэце. Багаццем ігры святла і ценю вылучаюцца афорты «Амнібус» (1891), «Мадонна» (1900). Працаваў і як скульптар.

ЦО́ТНАСЦЬ у фізіцы, *квантавы лік*, які характарызуе сіметрыю *хвалевай функцыі* квантавай сістэмы пры люстраным адбіцці каардынат. Захоўваецца пры моцных і эл.-магн. узаемадзеяннях (гл. *Прасторавая інверсія*), вядзе да пэўных *адбору правіл* для эл.-магн. выпра-

П.Цомпель. Асілак. 1986.

А.Цорн. Аўтапартрэт.

мянення атамаў і атамных ядраў, ядз. рэакцый і рэакцый узаемаператварэнняў элементарных часціц. Пры слабых узаемадзеяннях прасторавая Ц. парушаецца (захоўваецца камбінаваная Ц. — здабытак прасторавай і зарадавай Ц.).

ЦО́ТНЫЯ І НЯЦО́ТНЫЯ ФУ́НКЦЫІ, функцыі, якія не змяняюць свайго значэння (цотныя функцыі) ці мяняюць знак (няцотныя функцыі) пры змене знаку аргумента. Напр., функцыі $y = \sin x$, $y = x$, $y = x^3$ — няцотныя функцыі, $y = \cos x$, $y = x^2$ — цотныя. Сума і рознасць няцотных функцый — няцотныя функцыі, здабытак і дзель — цотныя; сума, рознасць, здабытак і дзель цотных функцый — цотныя функцыі. Графік цотнай функцыі сіметрычны адносна восі *Oy*, няцотнай — адносна пачатку каардынат.

Помнік братам **Цубам**.

ЦУ́БЫ, браты, героі Вял. Айч. вайны. Нарадзіліся ў в. Навіны (цяпер Цубы) Салігорскага р-на Мінскай вобл.

Міхаіл Самуілавіч (?—15.2.1943), адмовіўся паказаць дарогу да партызан гітлераўцам, якія праводзілі карную аперацыю «*Горнунг*» супраць Слуцкага і Пінскага партыз. злучэнняў. Расстраляны карнікамі.

Іван Самуілавіч (1873—15.2.1943), завёў групу карнікаў на забалочаны бераг р. Лань, адкуль яны не змаглі выбрацца. Расстраляны гітлераўцамі. Партызаны знішчылі карнікаў. У гонар братоў в. Навіны перайменавана ў в. Цубы. На радзіме помнік братам Ц. (скульпт. С.І.Селіханаў).

ЦУГ (Zug) Шыман Багуміл (20.11.1733, г. Мерзебург, Германія — 11.8.1807), польскі архітэктар; прадстаўнік класіцызму. З 1752 працаваў у Саксонскай буд. управе (г. Дрэздэн), з 1762 у Польшчы. Найб. значныя работы ў Варшаве: палацы Бланка (1762—64), К.Панятоўскага на Сольцы (1772), Браніцкіх, Сангушкаў (абодва з 1777) і інш., бровар на Сольцы (1768), лютэранская царква св. Тройцы (1777—80), ратуша на Лешне і дом Рослера і Гартвіга (абодва каля 1784), паркавы комплекс на Сольцы (1772—80). У Аркадзіі (каля Няборава) спраектаваў парк (з 1778), Дом прымаса (да 1783), храм Дзіяны (1783), акведук (1784). Перабудаваў палац А.Радзівіл у Нябораве (1775—80). На Беларусі паводле праекта Ц. пабудаваны драўляны палац Л.Тышкевіча ў в. Гародна Воранаўскага р-на Гродзенскай вобл. (1779—80, не захаваўся), які ўваходзіў у комплекс Гародзенскай сядзібы.

ЦУГА́РУ, Сангарскі праліў. Паміж а-вамі Хонсю і Хакайда (Японія). Злучае Японскае м. з Ціхім акіянам. Даўж. 96 км, найменшая шыр. 18 км, найменшая глыб. на фарватэры 110 м. Гал. парты: Хакадатэ (на в-ве Хакайда) і Аомары (на в-ве Хонсю). Пад Ц. пабудаваны самы доўгі ў свеце трансп. тунэль (каля 54 км).

ЦУД, нешта незвычайнае, што выклікае здзіўленне; у рэлігійных і міфалагічных уяўленнях звышнатуральная з'ява, выкліканая ўмяшаннем божай, незямной сілы. Шматлікія паданні пра Ц. характэрны для ўсіх рэлігій. У т.зв. рэлігіях адкрыцця (хрысціянства, іслам, іудаізм) Ц. лічыцца сведчаннем сапраўднасці божага адкрыцця і доказам усемагутнасці *Бога*. У пратэстанцкай тэалогіі паняцце «Ц.» набыло шмат інтэрпрэтацый: М.Лютэр далучаў да Ц. ўсе здзейсненні, якія адбываюцца ў свеце, сціраючы межы паміж натуральным і цудоўным. Прадстаўнікі *Цюбінгенскай школы* лічылі ўсе біблейскія паведамленні пра Ц. недакладнымі. Ф.Шлеермахер абвясціў Ц. рэліг. эквівалентам выпадковасці. Р.Бультман прапанаваў метад дэміфалагізацыі хрысціянства, згодна з якім хрысц. міфалогія страчвае рысы Ц., а сапраўднае тлумачэнне Ц. бачыў у атаясамленні веры ў Ц. і веры ў Бога.

ЦУЙ (Tsui) Даніэль Чы (н. 28.2.1939, прав. Хэнань, Кітай), амерыканскі фізік. Чл. Нац. АН ЗША (1987), Амер. акадэміі мастацтваў і навук (2000). З 1958 у ЗША. Скончыў Чыкагскі ун-т (1967). З 1982 праф. Прынстанскага ун-та. Навук. працы па цвердацельнай электроніцы, эл. уласцівасцях паўправадніковых мікраструктур і тонкіх плёнак, квантавай фізіцы электронных матэрыялаў (уздзеянне моцных магн. палёў і нізкіх тэмператур). Эксперыментальна адкрыў дробавы квантавы эфект Хола (1982; з А.Госардам і Г.*Шцёрмерам*). Нобелеўская прэмія 1998 (з Р.Б.*Лафлінам* і Шцёрмерам).

Тв.: Рус. пер. — Соотношение беспорядка и взаимодействия в двумерном электронном газе, помещенном в сильное магнитное поле // Успехи физ. наук. 2000. Т. 170, № 3.

М.М.Касцюковіч.

ЦУКА́НАЎ Сяргей Максімавіч (н. 29.2.1936, г. Ветка Гомельскай вобл.), бел. жывапісец. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1967). У 1967—91 (з перапынкамі) працаваў на Мінскім маст.-вытв. камбінаце. У 1969—75 дырэктар Мінскага маст. вучылішча імя А.К.Глебава. Працуе ў станковым жывапісе. Значнае месца ў творчасці займаюць сюжэтна-тэматычныя карціны ў стылі сац. рэалізму з дасканалай кампазіцыйнай пабудовай і адметным колеравым вырашэннем. Сярод твораў: «Смерць сельскага актывіста», «І.С.Лебедзеў, год 1924» (абодва 1967), «Паўстанне сялян вёскі Плутаўка Гомельскага павета ў 1904 годзе», «Першая маёўка ў Беларусі» (абодва 1968), «Харчатрад» (1971), «1941-ы год. Магілёўскі батальён міліцыі» (1975), «Даяркі саўгаса Халоч» (1976), «Першая вясна» (1980), «Выступленне А.Чарвякова на 4-м з'ездзе Саветаў Беларусі 4 снежня» (1983); пейзажы (у т.л. серыя «Вясна», 1995—2003); серыя нацюрмортаў «Грыбы» (1995—2003). Адзін з аўтараў афармлення дыярамы «Партызанскі лагер» (1968) у Бел. дзярж. музеі гісторыі Вял. Айч. вайны ў Мінску.

І.Л.Чэбан.

Ш.Б.**Цут**. Лютэранская царква святой Тройцы ў Варшаве. 1777—80.

ЦУ́КАР (ням. Zucker ад італьян. zuchero), крышталічны харчовы прадукт салодкага смаку. Мае ў сабе цукрозы 99,75—99,9%, мінер. элементаў 0,03%. Энергет. каштоўнасць 100 г каля 400 ккал. Атрымліваюць з *цукраносных культур*, на Беларусі пераважна з цукр. буракоў (маюць 17—20% цукрозы). Вырабляюць Ц.-пясок, Ц.-рафінад (прасаваны, літы, рафінаваны пясок), цукр. пудру. Выкарыстоўваюць як самаст. харч. прадукт, сыравіну ў кандытарскай, хлебапякарнай, кансервавай, вінаробнай і інш. вытв-сцях.

На цукровых з-дах цукр. буракі мыюць, рэжуць на дробную стружку, з якой гарачай вадой выдаляюць цукрозу. Атрыманы дыфузны сок апрацоўваюць нягашанай вапнай (дэфекацыя) і вуглякіслым газам (сатурацыя), фільтруюць, абясколерваюць сярністым газам (сульфітацыя), выпарваюць. Утвораны утфель (цукр. сіроп, сумесь крышталікаў цукрозы і міжкрышталь нага сіропу) цэнтрыфугуюць, прамываюць, высушваюць і атрымліваюць Ц.-пясок, з якога шляхам ачышчэння (рафінацыі) вырабляюць Ц.-рафінад. Гл. таксама *Цукровая прамысловасць*.

ЦУКЕ́РКІ, цукрыстыя *кандытарскія вырабы* пераважна мяккай кансістэнцыі. Маюць у сабе цукру да 70%, тлушчаў да 40%, вады 3—20%. Энергет. каштоўнасць 100 г 380—600 ккал. Вырабляюць на аснове ўзбітага цукрова-патачнага сіропу з рознымі напаўняльнікамі. Бываюць Ц. *карамель*, глазураваныя (шакаладнай, цукровай, памаднай глазурай), неглазураваныя, шакаладныя, ірыс, дражэ.

Паводле начынкі (корпуса) адрозніваюць Ц. памадныя («Маладзёжныя», «Ластаўка», «Цытрон», «Рамонак»), пралінавыя («Каракум», «Крыжачок», «Беларускія»), жэлейныя («Паўднёвая ноч», «Рабінавы гай»), фруктова-грыльяжныя («Клубнічны грыльяж»), грыльяжныя («Грыльяж на арахісе», «Грыльяж на фундуку»), лікёрныя («Сталічныя»), збіўныя («Суфле»), двухслойныя («Тальяначка») і інш. Гл. таксама *Кандытарская прамысловасць*.

ЦУКЕРМА́Н Веньямін Аронавіч (15.7.1913, г. Віцебск — 25.2.1993), расійскі фізік і вынаходнік. Д-р фіз.-матэм. н., праф. (1956). Герой Сац. Працы (1976). Скончыў Маскоўскі машынабуд. ін-т (1936). Працаваў у спец. н.-д. установах Масквы і Казані. З 1947 у ядз. цэнтры КБ-11 (г. Арзамас-16, цяпер г. Сароў). Навук. працы па вывучэнні працэсаў выбуху і дэтанацыі. Адзін з ініцыятараў выкарыстання знешняй імпульснай крыніцы нейтронаў у канструкцыях ядз. зарадаў. Удзельнік распрацоўкі і ўдасканалення сав. ядз. зброі. Ленінская прэмія 1957. Дзярж. прэміі СССР 1946, 1949, 1953, 1962.

Тв.: Люди и взрывы. Арзамас-16, 1994 (разам з З.М.Азарх).

Літ.: П о п о в Ф. Атомную бомбу делали и наши земляки // Бел гіст. часоп. 2000. № 4.

Ф.Дз.Папоў.

ЦУКЕРМА́Н Сямён (Саламон) Тобіясавіч (1902, г. Віцебск — 1988), расійскі канструктар-распрацоўшчык сістэм прыцэльвання. Скончыў Ленінградскі тэхнал. ін-т (1926). З 1930 ва Усесаюзным аб'яднанні оптыка-мех. прам-сці (нач. КБ, тэхн. дырэктар доследнага КБ), з 1936 гал. канструктар Дзярж. аптычнага ін-та (Ленінград). У 1937—42 і з 1947 у Ленінградскім ін-це дакладнай механікі і оптыкі (праф., у 1947—72 заг. кафедры). У 1942—47 заг. кафедры Маскоўскага вышэйшага вучылішча. Навук. працы па дакладным прыладабудаванні, канструяванні і юсціроўцы оптыка-электронных прылад. Распрацаваў шэраг прыцэльных прыстасаванняў для зенітнай і авіяц. артылерыі. Адзін са стваральнікаў серыйнага авіяц. гіраскапічнага прыцэла для знішчальнікаў «МіГ», мех. ракурснага прыцэла для дробнакаліберная зенітнай артылерыі.

Тв.: Точные механизмы: Основания теории, расчет и конструкция. Ч. 1—2. М., 1941; Управление машинами при помощи оптического луча. Л., 1969 (разам з А.С.Грыдзіным).

М.М.Касцюковіч.

С.Цуканаў. Харчатрад. 1971.

ЦУКРАНО́СНЫЯ КУЛЬТУ́РЫ, расліны, якія назапашваюць у тканках значную колькасць *цукроў* (пераважна *цукрозу*) і выкарыстоўваюцца для іх атрымання. Асн. Ц.к. — *цукровы трыснёг* (у тропіках і субтропіках) і цукр. *буракі* (ва ўмераным клімаце). Да Ц.к. адносяцца таксама цукр. клён (з соку атрымліваюць кляновы цукар), цукр. сорга, цукр. і вінная пальма, ражковае дрэва і інш.

Д.Ч.Цуй.

В.А.Цукерман.

ЦУКРАФІ́ЛЬНЫЯ РАСЛІ́НЫ, расліны, што назапашваюць у лісці толькі *цукры* ў адрозненне ад амілафільных раслін, у якіх канчатковы прадукт фотасінтэзу — *крухмал*. Да Ц.р. адносяцца цюльпан, рэпчатая цыбуля і інш.

ЦУКРО́ВАЯ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, галіна *харчовай прамысловасці* па вырабе *цукру*. Сыравіна — цукр. *буракі* і *цукровы трыснёг*. Найб. развіта Ц.п. на Кубе, у Бразіліі, Францыі, Кітаі, Расіі, на Украіне, у Індыі, Аўстраліі, Мексіцы, ЗША.

На Беларусі першы цукр. з-д пабудаваны ў 1830 у маёнтку Моладава (Іванаўскі р-н Брэсцкай вобл.). У 1860-я г. дзейнічалі 33 цукр. з-ды (найб. Парэцкі, Беліцкі і Іванскі). Не вытрымаўшы канкурэнцыі з цукр. з-дамі Украіны (цукар танней было прывозіць, чым вырабляць), да 1917 яны ўсе спынілі дзейнасць. Галіна пачала адраджацца пасля Вял. Айч. вайны. У 1947 пачаў будавацца *Скідзельскі цукровы камбінат*, які ў 1951 даў першую прадукцыю. З 1959 працуе *Гарадзейскі цукровы камбінат*, з 1963 — *Жабінкаўскі цукровы завод*, *Слуцкі цукрова-рафінадны камбінат*. Яны вырабляюць цукар-пясок, цукар-рафінад, лімонную кіслату. У зімовы перыяд (з кастр. па люты) перапрацоўваюць мясц. сыравіну (цукр. буракі), у астатні час — прывазны цукар-сырэц. Адходы вытв-сці цукру (макуха, патака, фільтрацыйныя асадкі) выкарыстоўваюць як кармавыя дабаўкі і ўгнаенне. У 2002 у галіне 4 прадпрыемствы, вытв-сць цукру-пяску склала 654,4 тыс. т, у т.л. з цукр. буракоў 180,3 тыс. т. Экспарт цукру-пяску з Беларусі (2000) склаў 256,3 тыс. т (у Расію і Украіну). Імпарт у Беларусь — 443 тыс. т, у т.л. з Бразіліі — 134,1 тыс. т, Кубы — 212,4, Аргенціны — 29,6 тыс. т.

П.І.Рогач.

ЦУКРО́ВАЯ ХВАРО́БА, тое, што *дыябет цукровы*.

ЦУКРО́ВЫ ТРЫСНЁГ (Saccharum), род кветкавых раслін сям. метлюжковых (злакавых). 5—10 відаў. Пашыраны ў трапічным, некаторыя ў субтрапічных паясах. Радзіма — Паўд.-Усх. Азія. У культуры Ц.т. высакародны (S. officinarum), вядомы за 3 тыс. гадоў да н.э. ў Індыі, з 6 ст. н.э. ў краінах Б. Усходу, Міжземнамор'я і Кітаі, з 16 ст. ў Паўд. Амерыцы і на Кубе.

Шматгадовыя (па-за тропікамі аднагадовыя) расліны. Сцёблы выш. да 6 м, таўшчынёй да 5 см. Суквецце — моцна разгалінаваная мяцёлка даўж. 70—90 см, пушыстая ад доўгіх шаўкавістых валаскоў, якія акружаюць кожны каласок. Сцёблы Ц.т. высакароднага маюць 10—18% цукрозы, спажываюцца ў ежу. З іх атрымліваюць больш за 60% цукру, што выпрацоўваецца ў свеце. З *мелесу* гатуюць ром. Адходы выкарыстоўваюць у буд-ве і на паліва. *В.М.Прохараў.*

ЦУКРО́ВЫЯ БУРАКІ́, гл. ў арт. *Буракі.*

ЦУКРО́ЗА, бураковы цукар, трыснягавы цукар, *дыцукрыд*, які складаецца з астаткаў D-глюкозы і D-фруктозы, $C_{12}H_{22}O_{11}$. Утвараецца ў лісці раслін у працэсе *фотасінтэзу*. З сокам ідзе ў сцёблы, карані, плады, там назапашваецца (ператвараецца ў *крухмал* або *інулін*). Ц. багатыя цукр. трыснёг, цукр. буракі (да 28% сухой масы), якія з'яўляюцца асн. крыніцай яе атрымання. У арганізме гідралізуецца салянай к-той страўнікавага соку і цукразай слізістай абалонкі тонкай кішкі.

Бясколерныя крышталі, салодкія, добра растваральныя ў вадзе; мал. м. 342,3, т-ра плаўлення 185—186 °С (вышэй за 200 °С утварае карамелі). Пры гідролізе пад уплывам слабых к-т і ферменту цукразы распадаецца на *глюкозу* і *фруктозу*. Выкарыстоўваюць як прадукт харчавання (гл. *Цукар*), у вытв-сці паверхнева-актыўных рэчываў (эфіры Ц. з вышэйшымі к-тамі), для мікрабіял. сінтэзу *дэкстранаў*. *І.М.Семяненя.*

ЦУКРЫМЕ́ТРЫЯ, метад вызначэння канцэнтрацыі растворaў аптычна актыўных рэчываў (гл. *Аптычная актыўнасць*), гал. чынам цукроў (адсюль назва). Засн. на залежнасці *вярчэння плоскасці палярызацыі* ад канцэнтрацыі раствору. Выкарыстоўваецца ў харч., хіміка-фармацэўтычнай прам-сці.

ЦУЛУКІ́ДЗЕ Тамара Рыгораўна (19.12.1903, Тбілісі — 9.2.1991), грузінская актрыса, бел. пісьменніца, перакладчык. Жонка А.*Пальчэўскага*. Засл. арт. Грузіі (1934). Скончыла Тбіліскі тэатр. ін-т (1924). Працавала ў Т-ры імя Ш.Руставелі (Тбілісі, 1926—36 і 1956—59), Сыктыўкарскім і Курскім лялечных т-рах (1946—50). Сярод роляў: Афелія («Гамлет» У.Шэкспіра), Амалія («Разбойнікі» Ф.Шылера), Ксенія («Разлом» Б.Лаўранёва). У 1936 і 1950 рэпрэсіравана. Рэабілітавана ў 1956. З 1959 жыла ў Мінску. Друкавалася з 1933. Пісала на груз., бел. і рус. мовах. У бел. друку з 1959. Аўтар дзіцячых п'ес (зб. «Тваё слова гонару», 1973), нарысаў (зб. «Блакітны факел», 1965), кн. «Да дзяцей прыйшоў важаты» (1967), апавяданняў пра т-р (зб. «Калі ўздымаецца заслона», 1963) і кн. «Усяго адно жыццё» (1983). Перакладала на груз. мову творы бел. і інш. пісьменнікаў.

Плантацыя **цукровага трыснягу** высакароднага.

ЦУНА́МІ (яп.), вялікія марскія гравітацыйныя хвалі, якія ўзнікаюць пераважна пры падводных землетрасеннях у выніку зрушэння (уверх або ўніз) працяглых участкаў дна. Даўж. 200—300 км, скорасць распаўсюджвання ад 50 да 1000 км/гадз, выш. хвалі ў вобласці ўзнікнення ад 0,1 да 5 м, каля ўзбярэжжа ад 10 да 50 м і больш. На ўзбярэжжы прычыняюць вял. разбурэнні і спусташэнні. Найб. характэрны каля берагоў Ціхага акіяна.



Схема ўтварэння **цунамі**.

ЦУРА́, ц ю п к а, даўняя страва беларусаў; гл. *Рулі.*

ЦУРБАКО́Ў Мікалай Іосіфавіч (н. 10.2.1911, г. Гомель — 8.10.1984), бел. акцёр. Засл. арт. Беларусі (1955). У 1931—35 акцёр Гомельскага трама, у 1938—41 Бел. т-ра юнага гледача імя Н.К.Крупскай, з 1942 Менскага гар., з 1944 Палескага, з 1946 Пінскага, з 1954 Магілёўскага, у 1955—74 Гомельскага абл. драм. т-раў. Акцёр шырокага творчага дыяпазону. Валодаў майстэрствам пераўвасаблення, сцэн. тэмпераментам, ствараў яркі вонкавы малюнак, карыстаўся гратэскавымі фарбамі. Сярод роляў: Канцлер («Цудоўная дудка» В.Вольскага), Юсаў («Даходнае месца» А.Астроўскага) у т-ры юнага гледача; Гарлахвацкі («Хто смяецца апошнім» К.Крапівы), Несцерка («Несцерка» Вольскага), Пустарэвіч («Паўлінка» Я.Купалы), Зянон («Калі зацвітаюць сады» В.Палескага), Ігнатаў («Таня» А.Арбузава), Хлопаў («Рэвізор» М.Гогаля), Ягор Булычоў («Ягор Булычоў і іншыя» М.Горкага) у Пінскім т-ры; Карп Маеўскі («Глыбокая плынь» паводле І.Шамякіна), Лявон («Лявоніха на арбіце» А.Макаёнка), Пётр Громаў («Угрум-рака» паводле В.Шышкова), Жывата Цвіёвіч («Доктар філасофіі» Б.Нушыча), Забродзін («Ленінградскі праспект» І.Штока) у Гомельскім т-ры.

Дз.У.Стэльмах.

ЦУ́РКА, у беларусаў прылада для вязання снапоў, кулёў саломы. У некат. мясцовасцях наз. закрутка. Невял. палачка даўж. 30—45 см, дыяметрам 2,5—3,5 см, у якой адзін канец танчэйшы і звычайна з зарубінамі, другі — таўсцейшы і нярэдка з разьбяным геам. арнаментам (зігзагі, косыя лініі, ромбікі і інш.). Адмыслова ўпрыгожаную Ц. хлопец дарыў каханай дзяўчыне, брат — сястры, муж — жонцы, таму на ёй нярэдка сустракаліся жан. імёны і ініцыялы. Была пашырана пераважна ў паўд. ч. Беларусі. *А.Ф.Літвіновіч.*

«ЦУ́РКА», бел. народная гульня. Існуе ў 2 варыянтах: Ц. за горадам і Ц. трайная. Для Ц. з а г о р а д а м бяруць 2 палкі і цурку — драўляную палачку даўж. 20—25 см (адсюль назва). Гульцы (2—6 чал.) чэрцяць на зямлі квадрат — «горад» і па жараб'ёўцы выбіраюць вядучага. Калі ён зловіць цурку, то мяняецца месцамі з гульцом, які яе адбіў; калі не, то з таго месца, дзе цурка ўпала, кідае яе ўгору і адбівае ў «горад». Калі пападзе, вядучы мяняецца месцамі з гульцом, які выбіў цурку. Калі ж не пападзе, то з таго месца, дзе цурка ўпала, ёю ж адмяраецца адлегласць да бліжэйшай «мяжы горада», а вынік залічваецца гульцу, што выбіў з «горада». Гульня працягваецца да таго часу, пакуль хто-небудзь з гульцоў не набярэ раней дамоўленую колькасць цурак. Для Ц. т р а й н о й бяруць 1 палку і 1 цурку. Гульцы (6 чал.) праводзяць лінію

і пасярэдзіне яе выкопваюць ямку. Затым дзеляцца на 2 каманды па 3 чал. Цурку кладуць упоперак ямкі, і кожны гулец каманды 3 спосабамі па чарзе кідае яе ў «поле» (за лінію). Калі гульцы ў «полі» зловяць цурку на ляту, то ім залічваюцца ачкі, калі не, то яе кідаюць у палку. Патрапіўшы ў яе 3 разы, гульцы набіраюць свае ачкі і мяняюцца месцамі з камандай праціўніка.

Я.Р.Вількін.

ЦУ́РУ Сігэта (н. 1912), японскі эканаміст, прадстаўнік *інстытуцыяналізму*. Д-р філасофіі (1940). Скончыў Гарвардскі ун-т (1935) і працаваў у ім у 1940—42. З 1944 супрацоўнік МЗС Японіі, у 1947—48 нам. кіраўніка Савета па эканам. стабілізацыі. Займаў пасады дырэктара Ін-та эканам. даследаванняў і рэктара Такійскага ун-та. Даследаваў праблемы макраэканам. дынамікі, цыклічнага развіцця яп. эканомікі, узаемадзеяння доўгачасовых фактараў эканам. росту з інстытуцыйнымі прынцыпамі грамадства. Лічыў, што дзярж. рэгуляванне эканомікі здольнае ўтаймаваць рыначную стыхію; для гэтага, на яго думку, праграмаванне павінна спалучаць у сабе *прагназіраванне* з антыцыклічным і мэтавым структурным рэгуляваннем. Асн. працы: «Палітыка і эканоміка ў барацьбе супраць забруджвання навакольнага асяроддзя» (1972), «Японскі эканамічны цуд скончыўся» (1978) і інш.

С.Ф.Дубянецкі.

ЦУСІ́МА, група астравоў у Карэйскім праліве; тэр. Японіі. Пл. каля 700 км^2. Гал. а-вы Камідзіма і Сімодзіма. Узгоркі і нізкагор'і выш. да 649 м. Берагі моцна парэзаныя. Пераважаюць лугі, участкамі шыракалістыя лясы. Пасевы рысу, інш. збожжавых, бульбы. Рыбалоўства. У 1905 у час руска-яп. вайны ў марскіх баях каля Ц. японскім флотам была разгромлена рус. эскадра (гл. *Цусімскі бой 1905*).

ЦУСІ́МСКАЕ ЦЯЧЭ́ННЕ, цёплае павярхневае цячэнне Японскага м., зах. галіна цячэння *Курасіо*. Накіравана з Пд на Пн уздоўж зах. берагоў Японіі. Уплывае на павышэнне т-ры вады ва ўсх. ч. Японскага м. на 5—6 °С зімой, на 1—3 °С летам. Скорасць да 1 км/гадз.

Цуркі.

ЦУСІ́МСКІ БОЙ 1905, Цусімская бітва, вырашальная марская бітва ў Карэйскім праліве каля а-воў Цусіма 27—28.5.1905 у *руска-японскую вайну 1904—05*. Адбылася пасля *Порт-Артура абароны* 1904—05 і гібелі 1-й Ціхаакіянскай эскадры, калі на Д. Усход прыбылі з Балт. мора 2-я і 3-я Ціхаакіянскія эскадры. Напярэдадні Ц.б. яны злучыліся пад агульным камандаваннем віцэ-адм. З.П.Ражэственскага (30 баявых караблёў, 228 гармат) і падышлі да Карэйскага праліва (накіроўваліся ва Уладзівасток). У ходзе Ц.б. яп. флот (121 баявы карабель, 910 гармат; каманд. адм. Х.Тога), які меў перавагу ў колькасці і хуткасці караблёў, артыл. узбраенні, разбіў лінейны баявы парадак рас. эскадры. 20 рас. караблёў, з іх 8 эскадраных браняносцаў, патоплены, 5 здаліся ў палон, у т.л. 2 эскадраныя браняносцы; 5 тыс. матросаў і афіцэраў загінулі і патанулі. Некалькі караблёў, у т.л. крэйсер «*Аўрора*», здолелі прарвацца ў Манілу і Шанхай. Ва Уладзівасток прабіліся 3 караблі. У яп. флоце патоплены 3 мінаносцы і больш за 10 мінаносцаў пашкоджаны; 116 чал. былі забітыя і 538 параненыя. Сярод рас. маракоў — удзельнікаў Ц.б. былі і ўраджэнцы Беларусі: А.Р.Арлоў, А.К.Грыб, В.Ф.Кот, С.В.Хруцкі і інш. Разгром сіл рас. флоту ў Ц.б. азначаў канчатковае паражэнне Расіі ў вайне.

Літ.: Золотарев В.А., Козлов И.А. Русско-японская война 1904—1905 гг.: Борьба на море. М., 1990; Доценко В.Д. Морские битвы России, XVIII—XX вв. СПб., 1999; Озеров К., Озеров Г. Правда о броненосце «Сисой Великий» (Цусима). 2 изд. Вильнюс, 2003; Адамянц-Подъяков В. Герои Цусимы — наши земляки // Заря. 2002. 10 окт.

У.Я.Калаткоў.

ЦУСІ́МСКІ ПРАЛІ́Ў, тое, што *Усходні праход*.

ЦХАЛТУ́БА, горад і бальнеалагічны курорт у Грузіі, у паўд. перадгор'ях Вял. Каўказа, на Калхідскай нізіне, у даліне р. Цхалтуба, за 9 км ад г. Кутаісі. Засн. ў 1926. З 1953 горад. 21 тыс. ж. (1991). Чыг. станцыя. Прам-сць: харч., хім., шкляная (вытв-сць хрусталю); вытв-сць буд. матэрыялаў. Клімат субтрапічны вільготны з цёплым летам (сярэдняя т-ра жн. 24 °С) і мяккай зімой. Тэрмальныя (33—35 °С) радонавыя азотныя сульфатна-гідракарбанатна-хларыдныя кальцыева-натрыевыя і магніевыя воды з мінералізацыяй каля 0,8 г/л (выкарыстоўваюць для ваннаў, інгаляцый, арашэнняў). Лечаць хваробы органаў апоры і руху, сардэчна-сасудзістай і нерв. сістэм, скуры, гінекалагічныя хваробы. Санаторыі, пансіянаты, пабудовы для водных працэдур. Краязнаўчы музей.

ЦХІНВА́ЛІ, горад у Грузіі, на р. Вял. Ліяхві. З 1922 горад; у 1934—61 наз. Сталініры. Да 1990 цэнтр Паўд.-Асецінскай аўт. вобл. 42,6 тыс. ж. (1991). Чыг. станцыя. Прам-сць: машынабудаванне, у т.л. эл.-тэхн., хім. (лакі, фарбы), швейная, харчовая (мясная, малочная, кансервавая). Пед. ін-т. Драм. тэатр. Краязнаўчы музей.

ЦЫ БАЙШЫ́, Ачжы, Хуан (1860, прав. Хунань, Кітай — 16.9.1957), кітайскі жывапісец, рэзчык пячатак, каліграф, паэт; найбуйнейшы майстар нац. кіт. жывапісу *гохуа*. У 1920—37 праф. Маст. ін-та ў Пекіне. Творы вылучаюцца багаццем танальных градацый, тонкай назіральнасцю, аўтарскім пераасэнсаваннем сярэдневяковых маст. традыцый: «Дванаццаць крабаў», «Курыца з куранятамі», «Арол» (усе 1930-я г.), «Крэветкі сярод водарасцей» (1946), «Персікі» (1948), «Лотас і жаба» (1954), «Цыкада на чырвоным лісце» (1955) і інш. Міжнар. прэмія Міру 1955.

Літ.: Миклош П. Ци Бай-ши: [Пер. с венг.]. Будапешт, 1963.

ЦЫБЛІЕ́Ў Васіль Васілевіч (н. 20.2.1954, с. Арэхаўка Крымскай вобл., Украіна), расійскі касманаўт. Герой Рас. Федэрацыі (1994). Лётчык-касманаўт Рас. Федэрацыі (1994). Скончыў Харкаўскае вышэйшае ваен. авіяц. вучылішча лётчыкаў (1975), Ваенна-паветр. акадэмію імя Гагарына (1987), Маскоўскі ін-т інжынераў геадэзіі, аэрафотаздымкі і картаграфіі (1997). З 1987 у Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў імя Гагарына (з 2000 нам. нач., з 2003 нач.). Здзейсніў 2 палёты ў складзе экіпажаў касм. караблёў (КК) і арбітальнай станцыі (АС): 1.7.1993—14.1.1994 — на КК «Саюз ТМ-17» і АС «Мір», 10.2—14.8.1997 — на КК «Саюз ТМ-25» і АС «Мір». У космасе правёў 381,7 сут, у т.л. ў адкрытым космасе 19,2 гадз (6 выхадаў). 2 медалі НАСА («За грамадскія заслугі», «За асваенне касмічнай прасторы»).

У.С.Ларыёнаў.

ЦЫБУ́ЛІНА, падземны, радзей надземны парастак раслін з кароткім патоўшчаным сяблом, т.зв. донцам, і мясістым лускападобным збліжаным лісцем; орган *вегетатыўнага размнажэння* і ўзнаўлення. Уласцівы пераважна эфемероідам сухіх гарачых абласцей (цюльпан, цыбуля) і шыракалістых лясоў (пралеска, падснежнік). Лускавінкі Ц. ўтвораны суцэльным лісцем, пазбаўлены хларафілу (лілея), асновамі фотасінтэзавальнага лісця (цыбуля) або іх спалучэннем (падснежнік). У лускавінках назапашваюцца вада і пажыўныя рэчывы (пераважна вугляводы).

Бываюць Ц. аднагадовыя (кандык, цюльпан, цыбуля) і шматгадовыя (амарыліс, нарцыс); монападыяльныя (узнаўленне адбываецца з верхавінкавай пупышкі, а кветаносны парастак утвараецца з пазушнай, напр., нарцыс, падснежнік) і сімпадыяльныя (кветаносны парастак развіваецца з верхавінкавай пупышкі, а ўзнаўленне адбываецца з пазушнай, напр., рабчык, цюльпан, цыбуля). Калі ў рост рухаюцца 2 або некалькі пупышак, Ц. разгаліноўваецца і ўтварае Ц.-дзеткі. У складаных

Ц. (часнок) у пазусе кожнай лускавіны фарміруецца некалькі Ц.-дзетак, т.зв. зубкоў. У некаторых відаў раслін Ц. (паветраныя) развіваюцца ў суквецці на месцы кветак (цыбуля) або ў пазусе лісця надземных парасткаў (лілея).

ЦЫБУ́ЛЬСКІ (Cybulski) Збігнеў (3.11.1927, Княжы, Польшча — 8.1.1967), польскі акцёр. Скончыў Вышэйшую тэатр. школу ў Кракаве (1953). Працаваў як акцёр і рэжысёр ў т-рах Гданьска і Варшавы. З 1955 здымаўся ў кіно: фільм А.Вайды «Пакаленне». У фільмах «Тры старты» (1955), «Канец ночы» (1957), «Попел і дыямент» (1958), «Каханне ў 20 гадоў» (1962) і інш. увасобіў тыповы вобраз суайчынніка ў складаны час маральнага і грамадскага станаўлення. У творчасці спалучаў драм. напружана-эмацыянальную манеру ігры з рамант. кірункам польскай тэатр. школы. Акцёр шырокага дыяпазону. Іграў і характарныя, і камед. ролі ў фільмах «Злачынец і паненка» (1963), «Разводаў не будзе», «Джузепе ў Варшаве» (абодва 1964) і інш. Складаная асоба акцёра, абставіны жыцця і творчасці, грамадскі водгук на яго мастацтва складаюць змест маст. фільма пра Ц. «Усё на продаж» (1968) і дакумент. кіналенты «Збышак» (1969). *Г.У.Шур.*

ЦЫБУ́ЛЬСКІ Міхаіл Леанідавіч (н. 10.7.1961, г. Віцебск), бел. мастацтвазнавец, жывапісец. Канд. мастацтвазнаўства (1989). Скончыў маст.-графічны ф-т Віцебскага пед. ін-та (1983). З 1988 выкладае ў Віцебскім ун-це. Даследуе праблемы тэорыі і гісторыі мастацтва, паэтыку і стылістыку бел. жывапісу 20 ст. Аўтар раздзелаў у кн. «Гісторыя беларускага мастацтва» (т. 5—6, 1992—94); уступных артыкулаў да каталогаў, альбомаў, буклетаў віцебскіх мастакоў і інш. Яго жывапісным кампазіцыям уласцівы эмацыянальная выразнасць, рэаліст. трактоўка вобразаў, насычаны каларыт: «Сафія Полацкая» (1985), «Сцяжынкамі Драздовіча», «Абарыген беларускай вёскі» (абедзве 2000), «Магілкі ля храма» (2001), «Двое ў начы» (2002).

Тв.: Искусство Древней Руси. Витебск, 1991; Беларускія абразы. Віцебск, 1993; Віцебская акварэль: Анталогія. Віцебск, 1995.

ЦЫБУ́ЛЬСКІ Пётр Пятровіч (5.1.1940, в. Ажуны Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. — 12.7.1998), бел. вучоны ў галіне тэхналогіі с.-г. вытв-сці. Д-р с.-г. н. (1994). Скончыў Бел. ін-т механізацыі сельскай гаспадаркі (1967). З 1974 у Бел. агр. тэхн. ун-це (з 1995 заг. кафедры). Навук. працы па праблемах выкарыстання электратэхнал. метадаў апрацоўкі кармоў у с.-г. вытв-сці.

Тв.: Обоснование вида теплоносителя для тепловой обработки кормов // Электротехнологические методы обработки кормов. Горки, 1983 (Сб. науч. тр.; Вып. 100); Использование ультразвука в подготовке к скармливанию радиационно-загрязненных грубых и концентрированных кормов // Ультразвуковая техника и технология: Тез. докл. Междунар. науч.-техн. конф. Мн., 1995. *Л.В.Бароўка.*

ЦЫБУ́ЛЯ (Allium), род кветкавых раслін сям. цыбулевых. Каля 500 відаў. Пашырана ў Паўн. паўшар'і. Уведзена ў культуру больш за 4 тыс. гадоў назад. Вырошчваюць 6 відаў Ц.: батун (A. fistulosum), парэй (A. porrum), рэпчатую (A. cepa), шалот, або аскалонскую (A. ascalonicum), шніт, ці скараду, або рэзанец (A. schoenoprasum), і *часнок*. На Беларусі 5 дзікарослых відаў Ц.: агародная (A. oleraceum), вінаградная (A. vineale), вуглаватая (A. angulosum), прычасночная (A. scorodoprasum), мядзведжая, або *чарамша*, і скарада занесены ў Чырв. кнігу. Трапляюцца па травяністых схілах, у хмызняках, як пустазелле ў пасевах.

Двух- і шматгадовыя травяністыя расліны. Лісце лінейнае, пляскатае або дудкаватае, шчыльна размешчанае на пакарочаным сцяб-

Цыбуля рэпчатая (1) і яе сарты: 2 — Стрыгуноўскі; 3 — Каба; 4 — Растоўскі кубасты; 5 — Цытаўскі; 6 — Маргеланскі; 7 — Данілаўскі.

Цыбуля: 1 — батун; 2 — слізун; 3 — парэй; 4 — мнагаярусная; 5 — шніт; 6 — цыбуліны шалоту.

ле (донцы). Кветкі дробныя, белыя, ружовыя або ліловыя, сабраныя ў шарападобныя парасонікі на доўгіх кветаносах; часам у іх утвараюцца паветраныя цыбуліны. Плод — карабачка. Насенне мае прамысл. назву чарнушка. Агароднінныя, лек., эфіраалейныя, дэкар. расліны.

ЦЫВІЛІЗА́ЦЫЯ (ад лац. civilis грамадзянскі, дзяржаўны), 1) тое, што *культура*. 2) Узровень, ступень развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры асобнага рэгіёна або этнасу (напр., ант., зах., усх., індустр., рас. Ц.). 3) Ступень грамадскага развіцця, якая настае пасля варварства.

Адрозніваюць 3 асн. формы (тыпы) Ц.: земляробчую (аграрную), індустрыяльную (тэхнагенную) і інфармацыйную (постіндустрыяльную). Ц. ўтвараюць і характарызуюць асаблівасці прыроднага асяроддзя (кліматычныя ўмовы, геагр. і дэмаграфічны фактар), узровень патрэбнасцей, здольнасцей, ведаў і навыкаў чалавека, эканам.-тэхнал. спосаб вытв-сці і лад сац.-паліт. адносін, этн. і нац. склад супольнасці, своеасаблівасці культ.-гіст. і рэліг.-маральных каштоўнасцей, характар і ступень духоўнай культуры. У тэорыі, распрацаванай М.Я.Данілеўскім, вылучаюцца 10 Ц. або культ.-гіст. тыпаў грамадства: егіп., кіт., асірыйска-вавілонска-фінікійская, ці халдзейская, інд., іранская, яўр., грэч., рым., новаемітычная, ці аравійская, германа-раманская, ці еўрапейская. Прыярытэт культ. пачатку ў Ц. адстойваў і А.Дж.Тойнбі, для якога Ц. — культура, якая дасягнула ўзроўню самаідэнтыфікацыі. На яго думку, адзінай гісторыі чалавецтва не існуе, як не існуе сусв. Ц.; гісторыя ўяўляе сабой «кругаварот» асобных Ц., што замкнуліся на сабе і паралельна, часам сінхронна суіснуюць. Паводле О.*Шпенглера*, з памяранне і смерцю культуры ўзнікае Ц., якая замяняе творчасць бясплоддзем, развіццё — акасцяненнем; культура «пладаносіць», стварае, распаўсюджваецца «ўглыб», а Ц. — разбурае, амярцвляе, распаўсюджваецца «ўшыр». Ён вылучыў 8 «пладаносных» і «магутных» культур: егіп., інд., вавілонскую, кіт., грэка-рым. (апалонаўскую), візант.-араб. (магічную), зах.-еўрап. (фаустаўскую) і культуру майя; прадугледжваў з'яўленне яшчэ ненароджанай рус.-сіб. культуры. На яго думку, кожная з гэтых культур рана ці позна ўваходзіць у стадыю заняпаду і амярцвення і нараджае новую Ц.

У вывучэнні Ц. гістарычна сфарміраваліся пазітыўны і негатыўны падыходы. Пазітыўны «фенаменалісцкі» або «прагрэсісцкі» падыход развівалі Л.Морган, Ф.Энгельс, І.Гердэр, Г.Бокль, Л.І.Мечнікаў, Э.Б.Тайлар і інш. Негатыўны падыход, які разглядае Ц. як пабочную з'яву гіст. развіцця, што нясе ў сабе пагрозу дэгуманізацыі, насілля над навакольнай прыродай і асабістай прыродай чалавека, разрыву паміж розумам і маральнасцю, адлюстравалі ў сваіх творах Ж.Ж.Русо, сацыялісты-утапісты, прадстаўнікі філасофіі персаналізму, экзістэнцыялізму, неафрэйдызму. Пад уздзеяннем працэсу глабалізацыі тэрмін «Ц.» стаў выкарыстоўвацца для характарыстыкі агульнага сацыякульт. адрознення паміж рознымі тыпамі Ц., суіснаванне і супрацьстаянне якіх характарызуе сучасны свет (М.М.Майсееў, В.С.Сцёпін, А.С.Панарын, І.І.Антановіч, Я.М.Бабосаў, А.М.Данілаў і інш.). З канца 20 ст. даследаванні Ц. накіраваны на пошук новай парадыгмы цывілізацыйнага развіцця, вывучэнне станаўлення і фарміравання «мегацывілізацыі» глабальнага свету, постіндустрыяльнай Ц.

Літ.: Бердяев Н.А. Смысл истории. М., 1990; Данилевский Н.Я. Россия и Европа. 6 изд. СПб., 1995; Данилов А.Н. Переходное общество: Пробл. системной трансформации. Мн., 1997; Ягож. Социология власти: Теория и практика глобализма. Мн., 2001; Сорокин П.А. Человек. Цивилизация. Общество. М., 1992; Тойнби А.Дж. Постижение истории: Пер. с англ. М., 1991; Шпенглер О. Закат Европы: Пер. с нем. Т. 1. М., 1993; Яковец Ю.В. История цивилизаций. М., 1995. *А.М.Данілаў.*

ЦЫВІ́ЛІС Клаўдзій Юлій (Claudius Julius Civilis), кіраўнік антырымскага паўстання ў 69—70. Паходзіў з саюзнага Рыму кельцкага племя батаваў. У 69 узначаліў паўстанне, якое падтрымалі плямёны галаў, германцаў і саюзныя падраздзяленні рым. войск. З-за адсутнасці адзінства паўстанне пацярпела паражэнне. Ц. не здолеў дамагчыся незалежнасці, аднак батавы былі вызвалены ад падаткаў. Далейшы лёс Ц. невядомы. *А.Г.Зельскі.*

ЦЫВІ́ЛЬНАЕ ГРАМА́ДСТВА, гл. ў арт. *Грамадзянская супольнасць.*

ЦЫВІ́ЛЬНАЕ ПРА́ВА, грамадзянскае права, галіна права, нормы якога рэгулююць маёмасныя і асабістыя немаёмасныя адносіны, што складваюцца паміж рознымі арг-цыямі і грамадзянамі і паміж грамадзянамі. Ахоплівае адносіны гасп. дзейнасці прадпрыемстваў і ўстаноў, грамадз. прававыя адносіны па пытаннях уладання, карыстання і распараджэння ўласнасцю, яе набыцця, адчужэння і інш. У прадугледжаных законам выпадках Ц.п. рэгулюе і інш. асабістыя немаёмасныя адносіны, напр., абарону гонару і годнасці. У адрозненне ад інш. галін права ўдзельнікі грамадз.-прававых адносін карыстаюцца правам самаст. вырашаць выбар варыянтаў паводзін, бо тут адсутнічаюць адносіны ўладнасці паміж спрэчнымі бакамі. Асн. форма абароны Ц.п. — аднаўленне парушанага права, а пры немагчымасці — кампенсацыя шкоды. Ц.п. класіфікуецца на падгаліны (аўтарскае, вынаходніцкае, жыллёвае, патэнтнае і інш.) і інстытуты (атрыманне ў спадчыну, дарэнне, наём жылога памяшкання і інш.). Асн. крыніцы Ц.п. на Беларусі — *Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь*, *Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь*, інш. заканад. і нарматыўныя акты.

ЦЫВІ́ЛЬНАЕ ПРАЦЭСУА́ЛЬНАЕ ПРА́ВА, галіна права, якая рэгулюе парадак *судаводства* па цывільных справах і выкананне суд. рашэнняў. У *цывільным працэсе* дзейнічаюць тыя ж суб'екты, што і ў *цывільным праве*. Разглядаюцца справы па спрэчках, што ўзнікаюць з цывільных, сямейных, прац. праваадносін, адм.-прававых спраў асаблівай вытворчасці і інш. Нормы Ц.п.п. фарміруюць мэты, задачы, правы і абавязкі суда пры ажыццяўленні правасуддзя па цывільных справах, вызначаюць падведамнасць і падсуднасць спрэчак, прававое становішча ўдзельнікаў цывільнага працэсу, рэгламентуюць ход суд. разбору і інш. Асн. прававы акт Ц.п.п. на Беларусі — *Грамадзянскі працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь.*

ЦЫВІ́ЛЬНАЯ АДКА́ЗНАСЦЬ, від юрыдычнай *адказнасці.*

ЦЫВІ́ЛЬНЫ ІСК у крымінальным працэсе, іск фізічнай ці юрыдычнай асобы, а таксама пракурора аб пакрыцці фізічнай, маёмаснай або маральнай шкоды, што прычынена непасрэдна злачынствам або грамадска небяспечным дзеяннем. Пры прад'яўленні Ц.і. ісцец вызваляецца ад дзярж. пошліны. Парадак даказвання такога іску ажыццяўляецца паводле адпаведнага працэсуальнага заканадаўства. Рашэнне па Ц.і. выносіцца судом у выглядзе пастановы аб прыгаворы або ўжыванні прымусовай меры бяспекі і лячэння.

ЦЫВІ́ЛЬНЫ КО́ДЭКС РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, гл. *Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь.*

ЦЫВІ́ЛЬНЫ ПРАЦЭ́С, парадак разбору і вырашэння судом цывільных спраў, а таксама парадак выканання пастаноў судоў і некаторых інш. органаў, устаноўлены нормамі *цывільнага працэсуальнага права.* Уключае рэгламентаваную законам дзейнасць судоў па ажыццяўленні правасуддзя, дзейнасць суд. выканаўцы, усіх удзельнікаў судаводства і звязаных з ім юрыд. адносін, што ўзнікаюць у працэсе *судаводства.* Крыніцамі Ц.п. з'яўляюцца *Грамадзянскі працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь* і *Гаспадарчы працэсуальны кодэкс* Рэспублікі Беларусь.

ЦЫВІ́ЛЬНЫ ПРАЦЭСУА́ЛЬНЫ КО́ДЭКС РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, гл. *Грамадзянскі працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь.*

ЦЫГА́ЛЬ Уладзімір Яфімавіч (н. 30.9.1917, г. Адэса, Украіна), расійскі скульптар. Нар. маст. СССР (1978). Правадз. чл. АМ СССР (1978). Вучыўся ў Маскоўскім маст. ін-це (1937—42, 1946—48). Працуе ў галіне манум. і станковай скульптуры. Творы вылучаюцца стрыманай выразнасцю пластычных і прасторавых вырашэнняў, эмацыянальнасцю і характарнасцю вобразаў. Аўтар надмагілля М.Астроўскага ў Маскве (1954), помнікаў У.Леніну ў г. Казань і Ульянаўск (абодва ўстаноўлены ў 1954), Дз.М.Карбышаву ў г. Маўтгаўзен

(Аўстрыя, 1962), Р.Зорге ў Баку (1981), шэрагу партрэтаў, мемарыяльнай стэлы Музея-помніка сав.-польскай баявой садружнасці ў в. Леніна Горацкага р-на Магілёўскай вобл. (1968). Адзін з аўтараў мемарыяльнага комплексу «Героям грамадзянскай вайны і Вялікай Айчыннай вайны 1941—45 гг.» у г. Новарасійск (1982, Ленінская прэмія 1984). Дзярж. прэмія СССР 1950.

ЦЫГА́НАЎ Аляксандр Рымавіч (н. 15.11.1953, г. Горкі Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне аграхіміі і аграэкалогіі. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (2003). Д-р с.-г. н. (1996), праф. (1997). Скончыў БДУ (1975). З 1981 у БСГА (з 1984 заг. кафедры, з 1993 прарэктар, з 1995 рэктар). Навук. працы па распрацоўцы прыёмаў і метадаў атрымання экалагічна чыстай прадукцыі раслінаводства, экспрэсных методык аналізу якасці аб'ектаў навакольнага асяроддзя і с.-г. прадукцыі.

Тв.: Экологические проблемы агрохимии. Мн., 1997 (разам з І.Р.Вільдфлушам, Т.П.Персікавай); Микроэлементы и микроудобрения. Мн., 1998 (разам з Т.П.Персікавай, С.П.Рэўцкай); Фосфор в почвах и земледелии Беларуси. Мн., 1999 (разам з І.Р.Вільдфлушам, В.В.Лапам); Биохимические и физиологические аспекты взаимодействия витаминов и биоэлементов. Сергиев Посад, 2002 (у сааўт.).

Літ.: А.Р.Цыганов: Библиогр. указ. Горки, 2000.

Герасімова, за 20 км на ПнЗ ад Віцебска. Пл. 0,24 км^2, даўж. 1,87 км, найб. шыр. 200 м, даўж. берагавой лініі 4 км. Катлавіна выцягнутая з Пн на Пд. Упадае ручай з воз. Лосвіда, выцякае р. Даўжанка.

ЦЫГАНО́Ў Дзмітрый Міхайлавіч (12.3.1903, г. Саратаў, Расія — 1992), расійскі скрыпач, педагог. Нар. арт. СССР (1979). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1922). Адзін з заснавальнікаў (1927) і ўдзельнік (да 1977) Квартэта імя Л.Бетховена. У 1930—86 выкладаў у Маскоўскай кансерваторыі (з 1935 праф., у 1956—81 заг. кафедры). Канцэртаваў як саліст і ў ансамблі з буйнымі музыкантамі свету. Першы выканаўца шматлікіх твораў рас. і замежных кампазітараў, у т.л. прысвечаных яму. Аўтар апрацовак для скрыпкі. Дзярж. прэмія СССР 1946.

ЦЫГАНЫ́ (саманазва р о м а́), прадстаўнікі этнічных груп, аб'яднаных агульнасцю паходжання і мовы. Жывуць у многіх краінах свету. Існуе падзел на вандроўных, паўвандроўных, аселых і паўаселых. Агульная колькасць ад 2,5 да 10 і больш млн. чал. (звесткі ЮНЕСКА). У Рэспубліцы Беларусь 9927 чал. (перапіс 1999). Гавораць на цыганскай мове, а таксама на мове таго народа, сярод якога жывуць. Веравызнанне Ц. залежыць ад пануючай рэлігіі краіны пражывання, прытрымліваюцца таксама традыц. вераванняў.

У.**Цыгаль**. Мемарыяльны комплекс у гонар савецка-польскай баявой садружнасці ў в. Леніна Горацкага раёна Магілёўскай вобл. Архітэктары Я.Белапольскі, В.Хавін. 1968.

ЦЫГАНКО́Ў Іван Сямёнавіч (1.12.1919, в. Лапатавічы Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл. — 5.2.2001), генерал-лейтэнант (1965). Канд. тэхн. н. (1973). Скончыў Ленінградскае артыл. тэхн. вучылішча (1939), Ваен. акадэмію імя Дзяржынскага (1948). У Чырв. Арміі з 1937. У Вял. Айч. вайну ў 1941—43 на Карэльскім фронце: нач. дывізіённай артыл. майстэрні, пам. нач. аддзела ўпраўлення, нач. артылерыі фронту. Удзельнік абароны Сав. Запаляр'я. Пасля вайны да 1981 у Мін-ве абароны СССР.

ЦЫГАНО́ВА, возера ў Віцебскім р-не, у бас. р. Лужасянка, за 1 км на Пн ад в.

Ц. — выхадцы з Індыі, якую пакінулі ў канцы І-га тыс. н.э. Першапачаткова аселі ў Пярэдняй Азіі, у 13—15 ст. — у Паўд.-Усх. і Усх., потым у Цэнтр. і Зах. Еўропе, Паўн. Афрыцы, Паўд. Амерыцы і Аўстраліі. Вялі вандроўны лад жыцця табарам. Падначальваліся выбранаму важаку, які вызначаў час і напрамак вандровак, спосаб здабывання сродкаў для існавання, быў афіц. прадстаўніком табара. Спрэчныя пытанні вырашаліся праз цыганскі суд з найб. паважаных і старэйшых па ўзросце членаў табара. Жанчыны цалкам падпарадкоўваліся бацьку, потым мужу, займаліся варажбой, папрашайніцтвам, знахарствам, спевамі і танцамі, клапаціліся пра забеспячэнне сям'і харчаваннем. Заняткі мужчын — канакрадства, гандаль коньмі, канавальства, рамёствы (кавальства, пляценне кашоў, разьба па дрэве) і інш. Месцам збору розных груп Ц. былі кірмашы. Аселыя і паўаселыя Ц. выконвалі абрады таго народа, сярод якога жылі, і традыцыйныя.

На Беларусі вылучаюць групы т.зв. рус. Ц. (жывуць на У Беларусі, саманазва «руска рома», вернікі — правасл.) і бел.-літ. Ц. (у паўн.-зах. раёнах Беларусі і прылеглых раёнах Літвы, аб'яднаны саманазвай «польска рома», вернікі — католікі). На Беларусь Ц. перавандравалі ў 15 ст. праз Польшчу і Германію, у канцы 16 — пач. 17 ст. з Венгрыі. Гал. месца збору вандроўных груп — мяст. Зэльва. У 17 ст. ўлады Рэчы Паспалітай спрабавалі прывучыць Ц. да аселага жыцця і далі ім адм. паўнамоцтвы: выбарныя вярхоўныя правіцелі наз. цыганскімі каралямі, баронамі, надзяляліся неабмежаванай уладай над Ц. Паўнамоцтвы каралёў зацвярджалі магнаты ВКЛ ці каралеўская канцылярыя. Найб. іх колькасць пражывала ў мяст. Мір (цяпер Гродзенскай вобл.). Займаліся сукнавальным, кавальскім і інш. рамёствамі. У 1790-я г. вял. колькасць бел. Ц. перасялілася ў Бесарабію, Малдавію і Валахію. Паводле перапісу 1897, на Беларусі было больш за 3 тыс. Ц. У працэсе рассялення склаліся лакальныя іх групы. У 1926 у БССР 2366 Ц., найб. групы ў Рэчыцкай (374), Віцебскай (325), Аршанскай (269) і Магілёўскай (264) акругах. У 1920—30-я г. ствараліся ўмовы для пераходу Ц. да аселага і прац. ладу жыцця: надзяленне іх зямлёй, арганізацыя цыганскіх калгасаў і школ. У 1925—28 дзейнічаў Усерас. саюз Ц. Вялася работа па арганізацыі Бел. саюза Ц. У 1926 уведзена цыганская пісьменнасць. У Вял. Айч. вайну Ц. пагражала фіз. знішчэнне з боку ням. фашыстаў. У 1956 прыняты ўказ Прэзідыума Вярх. Савета СССР «Пра далучэнне да працы цыганоў, якія займаюцца валацужніцтвам». Большасць з іх перайшла да аселага ладу жыцця, сялілася на ўскраінах гарадоў і ў прыгарадах (Паўн. пасёлак, пас. Сцяпянка ў Мінску, пас. Цітаўка каля Бабруйска і інш.). У пач. 1960-х г. у г. Дзяржынск Мінскай вобл. існаваў самадзейны цыганскі ансамбль песні і танца. У пасляваен. гады адбывалася перасяленне Ц. на Беларусь з інш. рэгіёнаў СССР. У 1959 на Беларусі жылі 4662 Ц., у 1970 — 6843, у 1979 — 8408, у 1989 — 10 762. Большасць іх пражывае ў гарадах (у 1999 — 80,7%). Паводле ацэнкі прадстаўнікоў цыганскай грамадскасці, Ц. на Беларусі да 50 тыс. чал.; такое вял. разыходжанне з афіц. звесткамі тлумачыцца тым, што значная частка Ц., грамадзян Беларусі, аднесла сябе пры перапісе да прадстаўнікоў інш. нацыянальнасцей. Паводле перапісу 1999, 77,5% бел. Ц. назвалі сваёй роднай мовай цыганскую. Сярод іх пашыраны эндагамныя шлюбы; сем'і, як правіла, мнагадзетныя.

У апошні час Ц. Беларусі пры захаванні традыц. найменняў усё больш ужываюць адзіную саманазву «беларуска рома». З сярэдзіны 1990-х г. на Беларусі з'явіліся прадстаўнікі этнагр. груп сярэднеазіяцкіх Ц. мусульманскага ве-

равызнання — джугі (назва ва Узбекістане) ці люля (у Таджыкістане). На 2002 у Рэспубліцы Беларусь зарэгістраваны 3 цыганскія грамадскія нац.-культ. аб'яднанні: Грамадскае аб'яднанне «Беларуская цыганская дыяспара», Бел. асацыяцыя цыганоў «Рома» (абедзве з 1998) і Міжнар. грамадская арг-цыя цыганоў «Адраджэнне» (з 2000), а таксама цыганскі дабрачынны фонд «БелРома» (з 2001).

Літ.: Даўгяла Дз.І. Цыганы на Беларусі // Наш край. 1926. № 12; Щербакова Т. Цыганское музыкальное исполнительство и творчество в России. М., 1984; Шпилевский П.М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю. Мн., 1992; Калінін В. Цыганы на Беларусі // З гісторыяй на «Вы»: Публіцыст. арт. Мн., 1994. Вып. 2; Дучыц Л. З гісторыі цыганоў Беларусі // Бел. гіст. часоп. 2003. № 3; Narbutt T. Rys historyczny ludu cygańskiego. Wilno, 1830.

І.В.Карашчанка.

ЦЫГЕ́ЙКА, футра, аўчына ад цыгайскай, мерыносавай і інш. парод *авечак*, пастрыжаная і пафарбаваная ў карычневы ці інш. колер. Выкарыстоўваюць для пашыву каўняроў, шапак, жан. паліто і інш.

ЦЫГЕЛЬНІ́ЦКАЯ Фаня Абрамаўна (парт. псеўд. Фейгла, Валя; 22.3.1906, г. Беласток, Польшча — 7.11.1988), дзеяч рэв. руху ў Зах. Беларусі. Удзельнік Вял. Айч. вайны. Жонка А.А.*Альшэўскага*. Скончыла Мінскую школу КПЗБ (1925), Камуніст. ун-т імя Свярдлова ў Маскве (1930). У 1923—25 кіраўнік Цэнтр. парт. сувязі КПЗБ. З 1926 сакратар Пінскага, Баранавіцкага, у пач. 1930-х г. — Слонімскага акр. к-таў КПЗБ. У 1927—28 чл. Часовага краявога сакратарыята ЦК КПЗБ, у 1932—33 упаўнаважаны ЦК КПЗБ па Віленскім краі і чл. Краявога сакратарыята ЦК КПЗБ. У 1933 прыгаворана польскімі ўладамі да 7 гадоў турмы. Пасля ўз'яднання Зах. Беларусі з БССР з 1939 на сав. рабоце ў Беластоку. Дэп. Нар. сходу Зах. Беларусі (28—30.10.1939, Беласток). У 1944—63 на парт. і сав. рабоце ў Гродне і Гродзенскай вобл. *І.А.Карпюк.*

ЦЫ́ГЛЕР (Ziegler) Карл Вальдэмар (26.11.1898, в. Хельза, паблізу г. Касель, Германія — 11.8.1973), нямецкі хімік-арганік. Скончыў Марбургскі ун-т (1920). У 1928—36 праф. Гайдэльбергскага ун-та. З 1936 дырэктар хім. ін-та пры ун-це ў Гале. З 1943 дырэктар ін-та даследавання вугалю ў Мюльгайме. Навук. працы па пытаннях каталітычнай полімерызацыі. Адкрыў (1953) змешаны тытан-алюмініевы каталізатар («каталізатар Ц.»), на якім атрыманы поліэтылен з рэгулярнай структурай. Распрацаваў прамысл. спосабы атрымання бутадыену, вышэйшых спіртоў і карбонавых к-т. Нобелеўская прэмія 1963 (з Дж.*Ната*).

ЦЫДЫНЖА́ПАЎ Гамбажап Цыдынжапавіч (3.5.1905, улус Любчыкан Баргузінскага р-на, Бурацыя — 1980), бурацкі акцёр, рэжысёр, драматург; адзін з заснавальнікаў бурацкага прафес. т-ра. Нар. арт. СССР (1940). Скончыў Дзяржінт тэатр. мастацтва ў Маскве (1934). З 1934 маст. кіраўнік Бурацкага муз.-драм. т-ра, з 1948 гал. рэжысёр Бурацкага т-ра драмы імя Х.Намсараева, у 1948—60 — Бурацкага т-ра оперы і балета (усе ў г. Улан-Удэ). Сярод роляў: Атэла («Атэла» У.Шэкспіра), Платон Крэчат («Платон Крэчат» А.Карнейчука) і інш. Паставіў оперы «Яўген Анегін» П.Чайкоўскага (1943), «Ціхі Дон» І.Дзяржынскага (1953) і інш. Аўтар лібрэта муз. драмы «Баір» (з А.Шадаевым; паст. 1938), п'ес «Сын народа», «Снайпер» (абедзве паст. 1943), кінасцэнарыя «Залаты дом» (1959, у сааўт.) і інш. Дзяржпрэмія СССР 1949.

ЦЫКА́ДАВЫЯ (Cicadinea, або Auchenorrhyncha), падатрад насякомых атр. раўнакрылых. 17 тыс. відаў. Асн. сям.: сапр. цыкадкі (Jassidae, ці Cicadellidae); гарбаткі, або бадушкі (Membracidae); сапр., або пеўчыя Ц. (Cicadidae); *пенніцы*, або слінявіцы; ліхтарніцы, або святланоскі, ці насаткі (Fulgoridae). Пашыраны пераважна ў тропіках. Жывуць на травяністай расліннасці, у глебе. На Беларусі каля 100 відаў з сям. гарбатак, пенніц і цыкадак.

Даўж. ад 2 мм да 6,5 см. Крылы ў размаху да 18,5 см. Цела зеленаватае, бурае, радзей чорнае, або плямістае. Для Ц. характэрна нерухомае сучляненне галавы з грудзямі. 2—3 простыя вочкі паміж вял. складанымі вачыма, колюча-сысучыя ротавыя органы. Вусікі кароткія, тоўстыя, 3-членікавыя. Пярэднія крылы перапончатыя або хіцінізаваныя з папярочным і падоўжным жылкаваннем. Пярэднія і сярэднія ногі хадзільныя, заднія найчасцей скакальныя. Лапкі 3-членікавыя. Многія віды маюць гукавы апарат. Яйцы адкладваюць звычайна ў сцёблы раслін. Лічынкі праходзяць у развіцці 5 узростаў. Кормяцца сокамі раслін. Некаторыя — шкоднікі с.-г. раслін, ёсць пераносчыкі вірусных і інш. хвароб.

С.Л.Максімава.



Да арт. **Цыкадавыя**: 1 — цыкада дубовая; 2 — гарбатка, ці бадушка рагатая; 3 — цыкадка збожжавая; 4 — цыкадка царственная; 5 — ліхтарніца сурынамская; 6 — німфаргерыус Грыгор'ева.

ЦЫКЛ (ад грэч. kyklos круг), 1) сукупнасць узаемазвязаных працэсаў, з'яў, дзеянняў, што складае замкнёны круг (напр., *вытворчы цыкл, цыкл тэрмадынамічны*). 2) Шэраг, паслядоўны рад чаго-н. (лекцый, канцэртаў, маст. твораў), што складае закончанае цэлае і аб'яднана агульнай тэматыкай. 3) Пэўная група навук (грамадскіх, прыродазнаўчых, тэхн.), аб'яднаных паводле якога-н. агульнага прынцыпу.

ЦЫКЛ у геалогіі, 1) цыклічнасць рэльефаўтварэння — заканамернае чаргаванне шэрагу рэльефаўтваральных працэсаў, абумоўленых перыядычнасцю геал. працэсаў (гал. чынам *тэктанічных рухаў*) і ваганняў клімату. У выніку адбываецца чаргаванне розных генерацый рэльефу — тэктанічнага, кантрастнага, дэнудацыйнага і выраўнаванага (пенепленізаванага). Ад-

начасова ўтвараюцца серыі або фармацыі карэлятыўных гэтым генерацыям марскіх і кантынент. адкладаў. 2) Цыкл складкавасці — цыкл развіцця платформ. Гл. ў арт. *Тэктанічны цыкл.*

ЦЫКЛ у мастацтве, серыя (група) жывапісных, скульптурных або графічных твораў манум.-дэкар. ці станковага характару, задуманая як адзінае цэлае і аб'яднаная адзіным сюжэтам або праграмай.

ЦЫКЛ ТЭРМАДЫНАМІ́ЧНЫ, замкнуты *кругавы працэс*, які ажыццяўляецца ў *тэрмадынамічнай сістэме*. Уяўляе сабой сукупнасць розных *тэрмадынамічных працэсаў*, напр., ізатэрмічнага, адыябатнага, ізабарнага, ізахорнага. Найб. важныя Ц.т. — *Карно цыкл*, цыклы Клапейрона, Клаўзіуса—Ранкіна і інш. Выкарыстоўваюцца для вывучэння работы цеплавых рухавікоў (унутр. і знешняга згарання, турбін, ракетных рухавікоў), халадзільных машын і інш.

ЦЫКЛААЛКА́НЫ, цыклапарафіны, цыклаланы, насычаныя монацыклічныя вуглевадароды агульнай формулы C_nH_{2n}, дзе $n \geq 3$. Ц. і іх вытворныя належаць да *аліцыклічных злучэнняў*. Паводле колькасці атамаў вугляроду ў цыкле падзяляюць на малыя (3—4), звычайныя (5—7), сярэднія (8—12) і макрацыклы (больш за 12). Асн. прыродная крыніца Ц. — *нафта* (гл. *Нафтэны*).

Малыя Ц. — газы, астатнія — вадкасці ці цвёрдыя рэчывы (C_{12} і макрацыклы). Добра растваральныя ў арган. растваральніках, мала ў вадзе. Цыклы ў Ц. няплоскія (за выключэннем цыклапрапану), іх устойлівасць павялічваецца ад C_3 да C_6, змяншаецца да C_9 і зноў нарастае. Паводле хім. уласцівасцей Ц. ад C_5 аналагічныя насычаным вуглевадародам, цыклапрапан і цыклабутан — ненасычаным. Характэрны рэакцыі са змяненнем велічыні цыкла, раскрыццём цыкла і трансанулярнай цыклізацыі (паміж атамамі сярэдніх цыклаў). Аказваюць наркатычнае ўздзеянне, напр., цыклапрапан і яго фторвытворныя выкарыстоўваюць як сродак інгаляцыйнага наркозу.

Я.Г.Міляшкевіч.

ЦЫКЛАГЕКСА́Н, цыклічны вуглевадарод, C_6H_{12}.

Бясколерная вадкасць з характэрным пахам, $t_{пл}$ 6,55 °С, $t_{кіп}$ 80,74 °С, шчыльнасць 778,5 кг/м^3. Не растваральна ў вадзе, змешваецца са спіртамі, эфірамі, хлоралканамі, амінамі, аліфатычнымі кіслотамі. Утварае азеатропныя сумесі з вадой, бензолам. Малекула Ц. існуе ў выглядзе ізамераў, пераважна канфармацый «крэсла» і «лодкі». Паводле хім. уласцівасцей Ц. — тыповы прадстаўнік *цыклаалканаў*. Пры яго дэгідрагенізацыі ўтвараецца бензол. Акісленнем Ц. ў розных умовах атрымліваюць цыклагексанон, цыклагексанол. Маецца ў нафце (0,9—1,5%), атрымліваюць гідрагенізацыяй бензолу. Ц. — сыравіна ў арган. сінтэзе; растваральнік эфірных алеяў, воскаў, лакаў, фарбаў і інш.; экстрагент у фармацэўтычнай прам-сці. Раздражняе дыхальныя шляхі. ГДК у паветры 1,4 мг/м^3.

Я.Г.Міляшкевіч.

ЦЫКЛАГЕКСАНО́Л, аліцыклічны спірт, $C_6H_{11}OH$.

Бясколерныя крышталі са слабым пахам камфоры, мал. м. 100,16, $t_{пл}$ 25,15 °С, $t_{кіп}$ 161,1 °С, шчыльн. 942 кг/м^3 (30 °С). Растваральнасць у вадзе 4,3% па масе, добра растворацца ў большасці арган. растваральнікаў. Утварае ўсе характэрныя для спіртоў вытворныя (напр., складаныя эфіры). Пры каталітычным акісленні Ц. кіслародам ўтвараецца *цыклагексанон*. Асн. прамысл. спосаб атрымання — гідрыраванне фенолу. Выкарыстоўваецца ў вытв-сці адыпінавай к-ты, цыклагексанону; растваральнік масел, воскаў, фарбавальнікаў; стабілізатар эмульсій, крэмаў і інш. У высокай канцэнтрацыі аказвае наркатычнае дзеянне (ГДК 10—15 мг/м^3).

ЦЫКЛАГЕКСАНО́Н, тыповы прадстаўнік *кетонаў*.

Бясколерная вадкасць з пахам ацэтону і мяты, $t_{пл}$ 40,2 °С, $t_{кіп}$ 155,6 °С, шчыльн. 946 кг/м^3. Добра растворацца ў большасці арган. растваральнікаў, дрэнна — у вадзе. У прам-сці атрымліваюць акісленнем цыклагексану кіслародам паветра, дэгідрыраваннем цыклагексанолу. Выкарыстоўваюць у вытв-сці адыпінавай к-ты, у якасці паўпрадукту ў вытв-сці капралактаму, растваральніка нітратаў і ацэтатаў цэлюлозы, воскаў, прыродных смол і інш. Раздражняе слізістыя абалонкі вачэй і скуры (ГДК 10 мг/м^3).

ЦЫКЛАДАЛУЧЭ́ННЯ РЭА́КЦЫІ, цыкладалучэнне, група арган. рэакцый, у якіх 2 ненасычаныя малекулы далучаюцца адна да адной з утварэннем новага цыкла. Суправаджаецца змяншэннем кратнасці сувязей.

Паводле колькасці атамаў кожнага кампанента адрозніваюць [2+1]-, [2+2]-, [2+4]-цыкладалучэнні і інш. Пры [2+1]-Ц.р. да кратнай сувязі малекулы далучаецца атам з запоўненай і адначасова вакантнай арбіталлю (напр., карбен, дыхлоркарбен), у выніку чаго ўтвараецца трохскладовы цыкл. Чатырохскладовыя цыклы ўтвараюцца ў выніку [2+2]-Ц.р., напр., з алкенаў утвараюцца замешчаныя цыклабутаны. Прыклад [2+4]-Ц.р. — *дыенавы сінтэз* (рэакцыя Дзільса—Альдэра), які дазваляе атрымаць шасціскладовы цыкл з рознымі замяшчальнымі групамі. Выкарыстоўваюцца Ц.р. ў арган. хіміі для сінтэзу карба- і гетэрацыклічных злучэнняў зададзенай структуры.

Я.Г.Міляшкевіч.

ЦЫКЛАМЕ́Н, альпійская фіялка, драква (Cyclamen), род кветкавых раслін сям. першакветных. Каля 20 відаў. Пашыраны ў Міжземнамор'і і Зах. Азіі. Трапляюцца ў горных, пераважна букавых і дубовых лясах, сярод хмызняку. На Беларусі ў аранжарэях і пакоях вырошчваюць сарты Ц. веснавога (C. vernum), еўрапейскага (C. europeum), персідскага (C. persicum) і інш.

Шматгадовыя травы з клубнепадобным карэнішчам дыям. да 10 см, ад якога адыходзяць пакарочаныя парасткі з разеткай лісця і кветаносамі. Лісце на доўгіх чаранках, нырка- або яйцападобнае. Кветкі адзіночныя, паніклыя, ружовыя, цёмна-чырв. або белыя. Плод — каробачка. Усе віды ядавітыя. Дэкар. расліны.

ЦЫКЛАПАРАФІ́НЫ, тое, што *цыклаалканы*.

ЦЫКЛАПІ́ЧНЫЯ ПАБУДО́ВЫ, збудаванні з вял. каменных глыбаў без сувязнога раствору. Назва паходзіць са Стараж. Грэцыі, дзе такія збудаванні прыпісвалі міфічным волатам — *цыклопам*. Рэшткі Ц.п. вядомы ва ўсіх частках свету. Яны з'явіліся ў 3—2-м тыс. да н.э. як культавыя і абарончыя збудаванні. Тэхніка Ц.п. пашырана ў Міжземнамор'і (а-вы Балеарскія, Мальта, Сардзінія). Найб. вядомы Ц.п. Крыта-мікенскай цывілізацыі (Тырынф, Мікены і інш.), крэпасці дзярж. Урарту (Тушпа і інш.), стараж. збудаванні андскіх народаў (інкі) і інш.

А.Г.Зельскі.

Цыкламен: 1 — калхідскі; 2 — Кузняцова.

ЦЫКЛАПРАПА́Н, трыметылен, вуглевадарод ацыклічнага раду.

Бясколерны газ, мал. м. 42,8, $t_{пл}$ 126,9 °С, $t_{кіп}$ 32,8 °С, шчыльн. 720 кг/м^3. Растваральна ў арган. растваральніках, дрэнна — у вадзе, лёгка ўзгараецца. У сумесі з паветрам выбуханебяспечны. Атрымліваюць дзеяннем цынку на 1,3-дыгалагенпрапан. Выкарыстоўваецца ў медыцыне як сродак для інгаляцыйнага наркозу. Эфіры цыклапрапанкарбонавай к-ты — сродак аховы раслін.

ЦЫКЛАТРО́Н [ад грэч. kyklos круг + *элек(трон)*], цыклічны рэзанансны паскаральнік цяжкіх зараджаных часціц (пратонаў, іонаў), у якім кіроўнае магн. поле і частата паскаральнага напружання пастаянныя ў часе. Часціцы ў Ц. рухаюцца па плоскай спіралі, якая разгор-

тваецца, пры гэтым часціцы могуць паскарацца да нерэлятывісцкіх энергій. Гл. таксама *Паскаральнікі зараджаных часціц*.

ЦЫКЛАТРО́ННЫ РЭЗАНА́НС, парамагнітны рэзананс, рэзананснае паглынанне эл.-магн. энергіі зараджанымі часціцамі, якія рухаюцца ў пастаянным магн. полі. Назіраецца ў паўправадніках, металах, а таксама ў вакууме.

Тлумачыцца на аснове законаў класічнай фізікі. Носьбіты зараду ў пастаянным магн. полі рухаюцца пад уздзеяннем *Лорэнца сілы* па спіральнай лініі, «навітай» на сілавую лінію магн. поля. Частата ω перыядычнага руху (цыклатронная частата; адсюль назва) звязана з індукцыяй магн. поля *B* суадносінамі: $\omega = qB/m$, дзе q — зарад і m — маса зараджанай часціцы. З'ява Ц.р. адбываецца на частаце, роўнай ці кратнай ω. Ц.р. выкарыстоўваецца ў фізіцы цвёрдага цела пры вывучэнні энергет. спектра электронаў, працэсаў электрон-фанонnага ўзаемадзеяння ў металах і інш.

ЦЫКЛАТРЫМЕТЫЛЕНТРЫНІТРАМІ́Н, тое, што *гексаген*.

ЦЫКЛІ́Т, цыклічны шасціатамны спірт; тое, што *іназіт*.

ЦЫКЛІ́ЧНАСЦІ ТЭО́РЫЯ, філасофская канцэпцыя, паводле якой у гісторыі грамадства перыядычна паўтараюцца вызначаныя цыклы або кругавароты. Кожны з іх мае 4 стадыі: зараджэнне, росквіт, заняпад, гібель. Гл. *Гістарычнага кругавароту тэорыя*.

ЦЫКЛІ́ЧНАЯ ЧАСТАТА́, тое, што *вуглавая частата*.

ЦЫКЛІ́ЧНЫЯ ЗЛУЧЭ́ННІ, злучэнні, якія маюць замкнёны ў кольца ланцуг атамаў.

Бываюць неарган. і арганічныя. Неарган. цыклы ўтвараюць асобныя атамы, напр., бор, сера. Сярод арган. Ц.з. адрозніваюць карбацыклічныя злучэнні (цыклы складаюцца з вугляродных атамаў, напр., *аліцыклічныя злучэнні, араматычныя злучэнні*) і *гетэрацыклічныя злучэнні* (у цыкле разам з атамамі вугляроду 1 або некалькі інш. атамаў). Могуць мець 1 цыкл (монацыклічныя, напр., *цыклаалканы*), 2, 3 і больш цыклаў (бі- і поліцыклічныя). Да бі- і поліцыклічных адносяцца: спіразлучэнні (хоць адна пара цыклаў мае агульны атам); кандэнсаваныя злучэнні (2 суседнія цыклы маюць 2 агульныя атамы, напр., *азулены, антрацэн, нафталін*); мастковыя злучэнні (утрымліваюць фрагмент, у якім 2 кольцы маюць 3 і больш агульных атамаў). Хім. ўласцівасці Ц.з. вызначаюцца прыродай атамаў, якія іх складаюць. Для многіх Ц.з. характэрна наяўнасць розных канфармацый (гл. *Канфармацыйны аналіз*).

ЦЫКЛІ́ЧНЫЯ НУКЛЕАТЫ́ДЫ, пурынавыя і пірымідзінавыя *нуклеатыды*, у якіх астатак фосфарнай к-ты звязваецца з *рыбозай* у 3′ і 5′-становішчах (утвараюць кольца); універсальныя рэгулятары біяхім. працэсаў у жывых клетках.

Найб. значныя цыклічны 3′ і 5′-адэназінмонафасфат (цАМФ) і 3′ і 5′-гуаназінмонафасфат (цГМФ). У арганізме жывёл і чалавека цАМФ рэгулюе клетачную пранікальнасць, мышачнае скарачэнне, сакрэцыю гармонаў, дыферэнцыроўку тканак і інш. У стрэсавых сітуацыях адрэналін праз пасрэдніцтва цАМФ актывуе ў клетках печані фермент глікагенфасфарылазу і ў кроў выкідваецца вял. колькасць глюкозы (крыніца энергіі для арганізма). Механізм дзеяння Ц.н. у клетцы звязаны з актывацыяй Ц.н.-залежных *пратэінкіназ* і зводзіцца да фасфарылявання спецыфічных бялкоў, у т.л. ферментаў, што прыводзіць да змены іх актыўнасці і адпаведных функцый клеткі. *І.М.Семяненя.*

ЦЫКЛІ́ЧНЫЯ ФО́РМЫ, цыклы, музычныя формы, якія складаюцца з некалькіх частак, завершаных паводле будовы і звязаных у цэлае адзінай маст. задумай. Паводле выканальніцкага складу і жанравых асаблівасцей бываюць інстр., вак. (вак.-інстр.) і сцэнічныя. Інструментальныя (сюітныя, санатна-сімф.) вядомы з эпохі Адраджэння, сфарміраваліся ў 17—18 ст. Сюітныя складаюцца з танц. п'ес, якія дапаўняюць адна адну па тэмпавым і жанравым кантрасце і аб'яднаны адной танальнасцю, маюць неабмежаваную колькасць частак (І.С.Бах, *Венская класічная школа*). У 19 ст. яны ператварыліся ў цыклы інстр. *мініяцюр*. Санатна-сімф. маюць складаны змест, 2—5 частак кантрастных тэмпа-жанравых суадносін з устойлівымі функцыямі і формамі (*сімфонія, саната, квартэт, канцэрт*), для іх характэрна тэматычнае адзінства частак і абагульненне папярэдняга развіцця ў фінале. У 19 ст. з'явіліся праграмныя санатна-сімф. Ц.ф., сімфоніі з нетрадыц. колькасцю частак. Свабодныя, змешаныя, кантрастна-складаныя формы могуць утвараць т.зв. самкнутыя цыклы. Вакальныя (кантатна-аратарыяльныя і камерна-вак.) — *месы, пасіёны, кантаты, араторыі*. У пач. 19 ст. ўзніклі камерныя вак. цыклы — *рамансы*, песні для голасу з суправаджэннем (Л. ван Бетховен, І.Брамс, Ф.Ліст, П.Чайкоўскі, Ф.Шуберт, Р.Шуман, С.Пракоф'еў, Г.Свірыдаў, Дз.Шастаковіч, Л.Абеліёвіч, А.Багатыроў, Э.Тырманд). Сцэнічныя (*опера, балет*, музыка да драм. спектакляў) засн. на заканамернасцях муз. формаўтварэння і прынцыпах драм. дзеяння. Паводле структурна-кампазіцыйных асаблівасцей опера і балет могуць быць аднесены да суперцыклаў: дзеянне ў іх арганізавана як самаст. комплекс складаных муз. форм.

Літ.: Мазель Л. Строение музыкальных произведений. М., 1960; Асафьев Б. Музыкальная форма как процесс. 2 изд. М., 1971; Протопопов В. Принципы музыкальной формы И.С.Баха. М., 1981; Ручьевская Е.А., Кузьмина Н.И. Цикл как жанр и форма // Форма и стиль. Л., 1990. Ч. 2; Дулова Е. Балетный жанр как музыкальный феномен: (Рус. традиция конца XVIII — нач. XX в.). Мн., 1999; гл. таксама да арт. *Форма музычная*. *К.М.Дулава.*



Цыкло́іда: 1 — звычайная; 2 — падоўжаная; 3 — укарочаная.

ЦЫКЛО́ІДА (ад грэч. kykloeidēs кругападобны, круглы), плоская крывая, траекторыя пэўнага пункта *P* круга, які коціцца без слізгання па прамой.

Параметрычнае ўраўненне Ц.: $x = r(t - d/r \cdot \sin t)$, $y = r(1 - d/r \cdot \cos t)$, дзе r — радыус круга, d — адлегласць ад пункта *P* да цэнтра круга, t — вугал павароту круга. Адрозніваюць Ц. звычайную ($d = r$), падоўжаную ($d > r$), укарочаную ($d < r$). Ц. шырока дастасоўваецца ў механіцы, тэорыі механізмаў і інш.

ЦЫКЛО́Н (ад грэч. kyklōn які круціцца), вобласць паніжанага *атмасфернага ціску*. Разам з *франтамі атмасфернымі* і



Цыклон. Ізабары і прыземныя лініі току паветра: а — Паўночнае паўшар'е, б — Паўднёвае паўшар'е.

антыцыклонамі — асн. прычына змен *надвор'я* і фарміравання асаблівасцей клімату. Адрозніваюць *трапічныя цыклоны* і ўласна Ц., да якіх належыць большая ч. Ц. зямнога шара.

Уласна Ц. ўяўляюць сабой буйныя віхры дыяметрам ад 1 тыс. км (у пачатку развіцця) да 2—3 тыс. км і больш (пры яго паглыбленні). Утвараюцца ва ўмераных і палярных шыротах Паўн. і Паўд. паўшар'яў пераважна на палярных і арктычных атм. франтах. У Паўн. паўшар'і цыркуляцыя паветра ў віхрах накіравана супраць, а ў Паўд. — па гадзіннікавай стрэлцы, з адхіленнем ад цэнтра Ц. ў ніжніх слаях атмасферы. На ўзроўні мора атм. ціск паніжаецца да 950—960 мбар (сярэдняе значэнне каля 1012 мбар), у розных частках Ц. адзначаюцца і тэмпературныя кантрасты. Перамяшчаюцца пераважна ўздоўж франтоў з З на У. Скорасць руху Ц. 30—40 км/гадз, часам больш за 80 км/гадз. Над кожным паўшар'ем за год бывае некалькі соцень Ц. Доўжацца ад некалькіх дзён да 1—2 тыдняў.

Выклікаюць утварэнне вял. і магутных воблакаў, выпадзенне ападкаў, рэзкую перамену надвор'я. На Беларусі за год адзначаецца каля 40% дзён з Ц., у снеж.—лютым і маі—ліп. каля 50%, у сак. і крас. — каля 30%, у вер. каля 15%.

ЦЫКЛО́Н у тэхніцы, апарат для ачысткі паветра (газу) ад завіслых у ім дамешкаў — цвёрдых часцінак, кропляў і да т.п. пад дзеяннем цэнтрабежных сіл. Звычайна Ц. — цыліндрычны рэзервуар з конусападобнай ніжняй часткай.

Бываюць цыліндрычнага (цыліндрычная частка большая за канічную) і канічнага (канічная частка большая за цыліндрычную) тыпу. Забруджанае паветра (газ) праз бакавую трубу паступае ў Ц., закручваецца як віхор, у выніку чаго цвёрдыя часцінкі і кроплі адкідваюцца да сценак, ападаюць уніз і выдаляюцца з камеры, а чыстае паветра ідзе ўверх і адсмоктваецца праз выхлапную трубу. Ц. цыліндрычнага тыпу выкарыстоўваюць у пнеўматрансп. установах, на мукамольных з-дах; канічныя — як пылаадзяляльнікі (часам іх злучаюць у батарэі). *В.М.Кандрацьеў.*

ЦЫКЛО́ПЫ, у старажытнагрэчаскай міфалогіі аднавокія волаты. Гл. *Кіклопы.*

ЦЫКЛО́ПЫ (Cyclopoida), падатрад (па інш. сістэме атр.) беспазваночных атр. весланогіх рачкоў кл. ракападобных. Больш за 250 відаў. Пашыраны ўсюды, пераважна ў прэсных водах, нямногія — планктонныя; некаторыя марскія Ц. свецяцца. На Беларусі каля 20 відаў.

Даўж. 1—8 мм. Маюць адно няпарнае лобнае вока (адсюль назва ад імя аднавокіх гігантаў з грэч. міфалогіі). Перамяшчаюцца скачкамі. У самак 2 яйцавыя мяшкі. Большасць драпежнікі, ёсць і раслінаедныя. Ц. кормяцца рыбы. Многія з іх паразіты рыб і беспазваночных, некат. прамежкавыя гаспадары паразітычных чарвей (напр., рышты, шырокага ленцяца).

ЦЫКО́РЫЯ (Cichorium), род кветкавых раслін сям. складанакветных. Каля 10 відаў. Пашыраны пераважна ў Еўразіі, Паўн. Афрыцы і як заносныя ва ўмераных паясах. На Беларусі 1 від — Ц. звычайная (C. intybus). Трапляецца на сухіх лугах, пустках, каля дарог. Інтрадукавана Ц. салатная, або эндывій (C. endivia).

Адна-, двух- і шматгадовыя травяністыя расліны. Сцёблы галінастыя. Лісце чаргаванае, ніжняе — ад перыстараздзельнага да зубчастага, верхняе — ланцэтнае. Кветкі блакітныя, радзей ружовыя ці белыя, сабраныя ў шматлікія кошыкі. Плод — сямянка. Ц. звычайная выкарыстоўваецца ў медыцыне, для атрымання сурагату кавы (патоўшчаныя каранi), спірту, ужываецца ў ежу як салата. Харч., тэхн., лек., меданосныя расліны.

В.М.Прохараў.

ЦЫКУ́ТА, в е х (Cicuta), род кветкавых раслін сям. парасонавых. Каля 10 (паводле інш. звестак 20) відаў. Пашыраны пераважна ў Паўн. Амерыцы. На Беларусі 1 від — Ц. ядавітая (C. virosa), нар. назва вяха, шалей. Трапляецца па берагах рэк, ускрайках балот, на вільготных лугах, часта ў вадзе.

Ц. ядавітая — шматгадовая травяністая расліна з тоўстым карэнішчам, падзеленым



Схема цыліндрычнага **цыклона**: 1 — уваходны патрубак; 2 — выхлапная труба; 3, 4 — цыліндрычная і канічная часткі корпуса; 5 — выпускны патрубак.

Цыклопы: 1 — сапфірына; 2 — анцэя; 3 — звычайны.

Цыкута ядавітая.

Цыкорыя: 1 — звычайная; 2 — яе культурная форма; 3 — разнавіднасці цыкорнай салаты (а — эндывій; б — эскарыёл).

на паветраныя камеры. Сцябло выш. да 1,5 м, прамастойнае, галінастае, пустое, часта з фіялетавым адценнем. Лісце двойчы- або тройчыперыстае, на доўгіх чаранках. Кветкі дробныя, белыя, сабраныя ў складаны парасонік. Плод — віслаплоднік. Уся расліна, асабліва карэнішча, мае таксін, які выклікае моцныя, часта смяротныя атручэнні свойскай жывёлы і чалавека. Лек., інсектыцыдная расліна.

ЦЫЛІ́НДР (ад грэч. kylindros валік, каток), 1) геаметрычнае цела, абмежаванае замкнёнай *цыліндрычнай паверхняй* і дзвюма паралельнымі сякучымі яе плоскасцямі. Часткі плоскацей, што абмяжоўваюць Ц., — асновы, адлегласць паміж імі — вышыня. Прамым наз. Ц., калі яго ўтваральная перпендыкулярная да асновы, кругавым — калі асновы кругі. Аб'ём прамога кругавога Ц.: $V = 2\pi R^2 h$, плошча бакавой паверхні: $S = 2\pi Rh$, дзе R — радыус асновы, h — вышыня Ц. 2) Полая дэталь з цыліндрычнай унутр. паверхняй, у якой рухаецца поршань у *поршневых машынах*. 3) Высокі, цвёрды мужчынскі капялюш з невял. палямі.

ЦЫЛІНДРЫ́ЧНАЯ ПАВЕ́РХНЯ, паверхня, утвораная рухам прамой (утваральнай) у прасторы так, што гэта прамая застаецца паралельнай зададзенаму напрамку і перасякае дадзеную крывую лінію (накіравальную). Накіравальнай Ц.п. могуць быць *акружнасць, эліпс* і інш. замкнёная крывая; пры гэтым утвараецца адпаведна *цыліндр*, абмежаваны гэтай паверхняй, а таксама *гіпербала, парабала* і інш.

ЦЫЛІНДРЫ́ЧНАЯ СІСТЭ́МА КААРДЫНА́Т, сукупнасць 3 лікаў r, θ, z, якая вызначае становішча пункта ў прасторы. З прамавугольнымі каардынатамі яны звязаны формуламі: $x = r \cdot \cos\theta$, $y = r \cdot \sin\theta$, $z = z$. Назва звязана з тым, што каардынатная паверхня r = const з'яўляецца цыліндрам, утваральная якога паралельная восі Oz.

ЦЫЛІНДРЫ́ЧНАЯ ХВА́ЛЯ, хваля, што радыяльна разбягаецца ад (збягаецца да) некаторай восі ў прасторы ці пункта на плоскасці (кругавая хваля). Напр., хвалі на паверхні вады ад кінутага камення.

Найпрасцейшая монахраматычная сіметрычная Ц.х. задавальняе двухмернае *хвалевае ўраўненне* і на вял. адлегласцях ад восі апісваецца асімптатычным выразам $u(r, t) \approx \frac{1}{\sqrt{r}} \exp$ $i(\omega t - kr)$, дзе $\frac{1}{\sqrt{r}}$ — амплітуда і $\omega t - kr$ — фаза Ц.х. *Фазавая скорасць* Ц.х. супадае з фазавай скорасцю плоскай хвалі. Ц.х. — істотна нестацыянарная хваля: пры аддаленні ад восі (цэнтра) яна пакідае «шлейф», які можна трактаваць як вынік прыходу хвалевых узбурэнняў ад усё больш аддаленых (ад пункта назірання) крыніц на восі.

ЦЫЛІ́НСКІС, Цылінскі (Cilinskis) Гунарс Алфрэдавіч (23.5.1931, г. Огрэ, Латвія — 25.7.1992), латвійскі акцёр, сцэнарыст, рэжысёр. Нар. арт. СССР (1979). Скончыў тэатр. ф-т Латв. кансерваторыі (1955). У 1955—75 у Латв. т-ры драмы імя А.Упіта. Сярод роляў: Оскар Клява («Сын рыбака» В.Лаціса), Няхлюдаў («Уваскрэсенне» Л.Талстога), Лаэрт («Гамлет» У.Шэкспіра). Выканаў ролі моцных і мужных людзей у фільмах «Накцюрн», «Моцныя духам», «У цені смерці», «Пад перакуленым месяцам» і інш. Паставіў фільмы: «Саната над возерам» (1976, з В.Браслам), «Раняя ржа» (1979), «Таран» (1982), «Страх» (1986), «Дзіўнае месяцавае святло» (1987), «Індраны» (1991) і інш. Дзярж. прэмія Расіі 1968. Дзярж. прэмія Латвіі 1977.

Літ.: Кокоревич Б.А. Гунар Цилинский. М., 1978.



Цыліндр: а — прамы кругавы; б — ссечаны.



Цыліндрычная сістэма каардынат.

ЦЫЛЯНЬША́НЬ, Рыхтгофена хрыбет, хрыбет у гарах *Наньшань*, на Пн Кітая. Даўж. больш за 500 км. Выш. да 5934 м. Складзены са сланцаў, пясчанікаў, вапнякоў. Асіметрычны: паўн. схіл даўж. да 40 км (перавышэнне над *Хэсі калідорам* да 4500 м), паўд. — да 12—15 км. Грабяні альпійскага тыпу. Прарэзаны скразнымі далінамі рэк Сулэхэ і Хэйхэ. На З пустыні, сухія стэпы, на У — горныя лугі на лёсах, на Пн — участкі хвойных лясоў. Ледавікі. Даследаваны рус. вучоным У.А.Обручавым у 1894, названы ім у гонар Ф.*Рыхтгофена*.

ЦЫМБАЛІ́СТ (Zimbalist) Яфрэм Аляксандравіч (9.4.1889, г. Растоў-на-Доне, Расія — 1985), амерыканскі скрыпач, педагог, кампазітар. Вучань Л.*Аўэра*. Канцэртаваў з 1907. З 1911 у ЗША. З 1928 выкладаў у Муз. ін-це Кёртыс у Філадэльфіі (у 1941—68 дырэктар і праф.). Ігра вылучалася тонкім артыстызмам і інтэлектуалізмам. Аўтар оперы «Ландара» (паст. 1956), муз. камедыі «Нектар» (паст. 1920), канцэртаў, арк. і камерных твораў, п'есы для скр. з фп. і інш. Складальнік школы ігры на скрыпцы «Штодзённыя практыкаванні на працягу гадзіны» (1918). Сярод вучняў Ш.Ашкеназі.

ЦЫМБА́ЛЫ (польск. cymbały ад лац. cymbalum, грэч. kymbalon), струнны ўдарны муз. інструмент. Мае драўляны плоскі корпус трапецападобнай формы, над верхняй дэкай якога нацягнуты метал. струны (па 2—3 у *хоры* ў фабр., 3—8 у нар.). Перасоўная падстаўка дзеліць Ц. на 2 няроўныя часткі (у прапорцыі 2:3). Гук здабываецца ўдарамі па струнах 2 палачкамі (малаточкамі, кручкамі), а таксама шчыпком. Пры ігры Ц. кладуць на калені ці на стол, спец. ножкі-падстаўкі. Існуюць у нар. і прафес. музыцы як сольны і ансамблевы інструмент.

Першыя выявы Ц. вядомы на асірыйскіх і вавілонскіх помніках. Былі пашыраны ў многіх народаў свету, у т.л. на Украіне, у Малдове (цамбал), Арменіі (сантур), Грузіі (сантуры, цынцыла), Узбекістане (чанг). З 16 ст. вядомы ў Зах. Еўропе пад рознымі назвамі, у т.л. хакбрэт.



Цымбалы.

Сям'я рэканструяваных **цымбалаў**.

На Беларусі — адзін з асн. традыц. нар. інструментаў. Першыя звесткі адносяцца да 16 ст., сустракаюцца ў «Бібліі» Ф.Скарыны (2-я кн. «Царстваў»). Выкарыстоўваліся ў паказах батлейкі, часта ўпамінаюцца ў нар. песнях. Нар. Ц. бываюць рознага памеру («палавінка», «паўтарачка», «цэлыя») і дыяпазону (ад 1,5 да 2,5 актаў); у ніжнім рэгістры маюць прыкметы натуральных ладоў, у сярэднім — няпоўны храматычны гукарад. У залежнасці ад ігры (сола ці ў нар. ансамблі) адрозніваюць строі «просты», «любіцельскі» і «скрыпічны», «гармонікавы» («баянны»). Гук нар. Ц. моцны, працяглы (у адрозненне ад прафесіяналаў нар. музыканты не глушаць струны). Ц. выраблялі нар. майстры І.Новік, В.Рогач, П.Грабянькоў, В.Пратасевіч і інш. Як прафес. інструмент Ц. існуюць з пач. 20 ст. У выніку ўдасканалення Ц. на іх выконваюць у пералажэннях складаныя, буйнамаштабныя творы муз. класікі і сучасных бел. кампазітараў (Л.Абеліёвіча, Г.Вагнера, В.Войціка, Я.Глебава, А.Клеванца, Дз.Смольскага, Э.Тырманд, К.Цесакова, Л.Шлег, А.Янчанкі і інш.). Значны ўплыў на развіццё выканальніцтва і стварэнне рэпертуару для Ц. зрабіў І.*Жыновіч*. Сям'я Ц. у аснове *Дзяржаўнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь*, самадз. і прафес. нар. аркестраў і ансамбляў. Класы ігры на Ц. існуюць у Бел. акадэміі музыкі, муз. вучылішчах і школах Беларусі. Сярод бел. выканаўцаў: А.*Астрамецкі*, В.*Бурковіч*, М.*Шмелькін* і інш. Выраб Ц. наладжаны на Барысаўскім прадпрыемстве муз. інструментаў.

Літ.: Жинович И.И. Школа игры на цимбалах. 2 изд. Мн., 1974; Назина И.Д. Белорусские народные музыкальные инструменты: Струнные. Мн., 1982. *З.М.Насценка.*

ЦЫМЕРВА́ЛЬДСКАЯ КАНФЕ́РЭНЦЫЯ 1915, міжнародная сацыяліст. канферэнцыя, што адбылася 5—8.9.1915 у пас. Цымервальд (Швейцарыя). 38 дэлегатаў з 11 еўрап. краін, у т.л. з Рас. імперыі. Большасць яе дэлегатаў складалі цэнтрысты, якім супрацьстаяла група інтэрнацыяналістаў — *Цымервальдская левая*. Асн. пытанне на канферэнцыі — барацьба пралетарыяту за мір ва ўмовах 1-й сусв. вайны. Прыняты Ц.к. кампрамісны маніфест адзначыў імперыяліст. характар вайны, а курс лідэраў *Інтэрнацыянала 2-га* на падтрымку рабочымі ваен. намаганняў сваіх урадаў заклеймаваў як здрадніцтва прынцыпам інтэрнацыяналізму. На Ц.к. ўтварылася т.зв. Цымервальдскае міжнар. аб'яднанне — блок рэв. сацыялістаў-інтэрнацыяналістаў з цэнтрыстамі, які афіцыйна распушчаны на 1-м кангрэсе *Камуністычнага Інтэрнацыянала* ў сак. 1919.

ЦЫМЕРВА́ЛЬДСКАЯ ЛЕ́ВАЯ, міжнародная група рэв. сацыялістаў — праціўнікаў удзелу пралетарыяту і пралет. партый у 1-й сусв. вайне; дзейнічала ў складзе т.зв. Цымервальдскага аб'яднання 1915—19. Створана па ініцыятыве У.І.*Леніна* напярэдадні *Цымервальдскай канферэнцыі 1915*, у час і пасля якой супрацьстаяла цэнтрыстам і блізкім да іх групам. Ідэі Ц.л. прапагандаваў Ленін, яе Бюро выпусціла 2 нумары час. «Vorbote» («Прадвеснік»). Ц.л. ўдзельнічала ў *Кінтальскай канферэнцыі* 1916. Спыніла існаванне з утварэннем *Камуністычнага Інтэрнацыянала* ў сак. 1919.

ЦЫМЛЯ́НСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА. На р. Дон, у Валгаградскай і Растоўскай абл. Расіі. Утворана плацінай аднайм. ГЭС. Запоўнена ў 1952—59. Пл. 2700 км^2, аб'ём 23,9 км^3, даўж. 302 км, найб. шыр. 38 км, сярэдняя глыб. 8,8 м. Шматгадовае рэгуляванне сцёку; ваганні ўзроўню да 5 м. Жывіць *Волга-Данскі суднаходны канал*. Выкарыстоўваецца для суднаходства, арашэння, рыбалоўства і адпачынку. На Ц.в. парты Валгадонск, Калач-на-Доне.

ЦЫН (кіт., літар. — чыстая), імператарская дынастыя ў Кітаі ў 1644—1912 з маньчжурскага роду Айсінь Гёра. Прыйшла да ўлады ў выніку заваявання значнай ч. Кітая войскамі *Маньчжурыі* ў час падаўлення *сялянскай вайны 1628—45*, якая прывяла да падзення дынастыі *Мін*; пры першых імператарах Шуньчжы [1644—61] і Кансі [1662—1722] да 1683 авалодала ўсёй тэр. б. імперыі Мін. У 1680—1790-я г. цынскія імператары далучылі да Кітая землі Прыамур'я, Усх. Туркестана, Тыбета і інш.); найвыш. росквіту дасягнула кіт. сярэдневяковая культура. З канца 18 ст. імперыя Ц. паступова прыходзіла ў заняпад. У сярэдзіне 19 — пач. 20 ст. ў выніку шэрагу няўдалых войнаў і нераўнапраўных дагавораў Кітай трапіў у залежнасць ад вядучых зах.-еўрап. дзяржаў, Расіі і Японіі; аўтарытэт дынастыі Ц. у кіт. грамадстве быў падарваны. Пры імператару Гуансюю [1875—1908] у 1898 здзейснена спроба рэфармавання Кітая (гл. «*Сто дзён рэформ*»), але задушана імператрыцай *Цысі* (фактычная правіцельніца краіны ў 1861—1908). Дынастыя Ц. скінута *Сіньхайскай рэвалюцыяй 1911—13*. 12.2.1912 ад прастола адрокся апошні цынскі імператар малалетні Пу І (у 1934—35 імператар *Маньчжоў-Го*), у Кітаі быў усталяваны рэспубліканскі лад.

Літ.: Маньчжурское владычество в Китае: [Сб. статей]. М., 1966; Сидихменов В.Я. Маньчжурские правители Китая. М., 1985.

ЦЫ́НА Луцый Карнелій (Lucius Cornelius Cinna; каля 130—84 да н.э.), старажытнарымскі ваен. і паліт. дзеяч, паплечнік Гая *Марыя*. У 87—84 да н.э. консул. Пасля ад'езду ў 87 да н.э. Л.К.*Сулы* на вайну з *Мітрыдатам VI Еўпатарам* прапанаваў законапраекты супраць суланцаў, але пацярпеў паражэнне і пакінуў Рым. Узначаліў (з К.Серторыем) легіёны ў Кампаніі. Да яго арміі далучыліся італікі і рабы. Аб'яднаўшыся з войскамі Марыя, Ц. ўзяў у аблогу і захапіў Рым. Пасля смерці Марыя ўзначаліў *папуляраў*, правёў дэмакр. пераўтварэнні (адмяніў суланскія законы, размеркаваў італікаў па 35 трыбах, часткова скасаваў даўгі і інш.). Забіты ў час бунту легіянераў.

Літ.: Плутарх. Избранные жизнеописания. Мн., 1998. *А.Г.Зельскі.*

ЦЫНГА́, скорбут, хвароба, выкліканая працяглай нястачай *аскарбінавай кіслаты* ў арганізме. Прыкметы: стамляльнасць, зніжэнне апетыту, бледнасць, сухасць і лушчэнне скурнага покрыва, кровазліццё ва ўнутр. органы, мышцы, скуру; *гінгівіт*, выпадзенне зубоў, мышачная слабасць і інш.

Пры Ц. павялічваецца пранікальнасць капіляраў, змяншаецца ўсмоктванне жалеза ў кішэчніку і інш. Часам далучаюцца інфекц. захворванні, абвастраюцца хранічныя інфекцыі. Лячэнне: прэпараты вітаміну С і інш. Прафілактыка: ужыванне прадуктаў, багатых вітамінам С. *І.М.Семяненя.*

ЦЫНДА́О, горад на У Кітая, на паўд. узбярэжжы Шаньдунскага п-ва, прав. Шаньдун. 1,5 млн. ж. (1990). Трансп. вузел. Буйны марскі порт у заліве Цзяочжаўвань Жоўтага м. Прам-сць: тэкст. (баваўняная, шарсцяная, ільняная, трыкат.), трансп., радыётэхн., металургічная, хім., электронная, гумавая, харч., тытунёвая, гарбарная, цэментавая. База рыбалоўства. Марскі курорт. Акіянаграфічны НДІ. Марскі музей.

ЦЫНЕРА́РЫЯ (Cineraria), род кветкавых раслін сям. складанакветных. Каля 50 відаў. Пашыраны ў трапічнай Афрыцы. У аранжарэях і пакоях вырошчваюць Ц. гібрыдную (C. hybridica), прыморскую (C. maritima), скрываўленую (C. cruenta) і інш.

Шматгадовыя травы і паўкусты выш. да 60 см. Сцёблы голыя або апушаныя. Лісце суцэльнае ці перыстарассечанае. Кветкі ў кошыках, сабраных у суквецце шчыток. Плод — сямянка. Дэкар. расліны.

ЦЫНІ́ЗМ (позналац. cynismus ад грэч. kynismos вучэнне *кінікаў*), бессаромныя, нахабныя паводзіны ў адносінах да чаго-н., прасякнутыя пагарджаннем да норм грамадскай маралі; нігілістычнае стаўленне да здабыткаў агульначалавечай культуры. Ц. у паводзінах і перакананнях найб. характэрны для людзей, якія імкнуцца дасягнуць сваіх эгаістычных мэт любымі сродкамі.

ЦЫ́НІЯ (Zinnia), род кветкавых раслін сям. складанакветных. Больш за 15 відаў. Пашыраны ў Амерыцы. У Еўропе з 18 ст. На Беларусі інтрадукаваны Ц. зграбная (Z. elegans) і вузкалістая, або Харе (Z. angustifolia, Z. haageana).

Адна- і шматгадовыя травяністыя расліны, радзей паўкусты. Лісце супраціўнае, суцэльнае. Кветкі язычковыя і трубчастыя, сабраныя ў простыя ці махрыстыя адзіночныя буйныя кошыкі аранжавага, белага, жоўтага, пурпуровага, чырв. колеру. Плод — сямянка. Дэкар. расліны.

ЦЫНК (лац. Zincum), Zn, хімічны элемент II групы перыяд. сістэмы, ат. н. 30, ат. м. 65,39. Прыродны Ц. складаецца з 5 стабільных нуклідаў з масавымі лікамі 64,66—68,70, найб. пашыраны ^{64}Zn (48,6%). У зямной кары $7 \cdot 10^{-3}$% па масе; найважн. мінералы: *сфалерыт* і *вюрцыт*. Адзін з біягенных элементаў, уваходзіць у састаў некат. ферментаў і гармонаў (сутачная патрэбнасць чалавека 15 мг). Сплаў Ц. з меддзю (гл. *Латунь*) вядомы з глыбокай старажытнасці.

Блакітнавата-белы метал, $t_{пл}$ 419,58 °С, $t_{кіп}$ 906,2 °С, шчыльн. 7133 кг/м^3. У сухім паветры пакрываецца тонкай ахоўнай плёнкай *цынку аксіду*, у вільготным, асабліва ў прысутнасці дыаксіду вугляроду, паступова разбураецца пры пакаёвай т-ры. Узаемадзейнічае з к-тамі і шчолачамі, аміякам і солямі амонію, вільготным хлорам і бромам (гл. *Цынку злучэнні*); пры нагрэванні — з кіслародам, халькагенамі, фосфарам, мыш'яком і сурмой. Атрымліваюць пры перапрацоўцы сульфідных цынкавых і поліметал. руд. Выкарыстоўваюць як кампанент сплаваў (гл. *Цынкавыя сплавы*), для антыкаразійнага пакрыцця (*цынкаванне*) жалеза і сталі, вырабу дробных дэталей самалётаў і аўтамабіляў, электродаў хім. крыніц току. *А.П.Чарнякова.*

Цынія зграбная.

ЦЫНКАВА́ННЕ, пакрыццё метал. вырабаў слоем *цынку* або яго сплаву. Робіцца апусканнем вырабу ў расплаўлены цынк, *напыленнем* расплаўленага цынку, электралітычным спосабам (*гальванастэгіяй*) або дыфузійным насычэннем цынкам з паравой або газавай фазы пры высокіх (да 850 °С) т-рах паверхневых слаёў вырабу (гл. *Металізацыя*). Прызначана ў асн. для аховы вырабаў ад карозіі.

ЦЫ́НКАВАЯ ПАДМА́НКА, другая назва мінералу *сфалерыт*.

ЦЫ́НКАВЫ КУПАРВА́С, гл. ў арт. *Цынку злучэнні*.

ЦЫ́НКАВЫ ШПАТ, другая назва мінералу *смітсаніт*.

ЦЫ́НКАВЫЯ РУ́ДЫ, гл. ў арт. *Поліметалічныя руды*.

ЦЫ́НКАВЫЯ СПЛА́ВЫ, сплавы на аснове *цынку* з дабаўкамі алюмінію, медзі, магнію. Характарызуюцца невысокай тэмпературай плаўлення, добрай цякучасцю, лёгка апрацоўваюцца ціскам, зварваюцца і паяюцца, але адрозніваюцца малой трываласцю пры павышаных тэмпературах, схільнасцю да карозіі. Выкарыстоўваюцца для вырабу друкарскіх шрыфтоў, дэталей аўтамабіляў, пральных машын, пыласосаў і інш.

Р.Цынкернагель.

ЦЫ́НКАВЫЯ ЎГНАЁННІ, мінеральныя рэчывы, якія маюць у сабе *цынк* у даступнай для раслін форме; адзін з відаў *мікраўгнаенняў*. Паскараюць акісляльна-аднаўляльныя рэакцыі ў раслінах, стымулююць сінтэз хларафілу, вітамінаў Р і С, роставых рэчываў. У якасці Ц.у. выкарыстоўваюць сульфаты і інш. солі цынку, цынкавы амафос, цынкавае полімікраўгнаенне і інш. Асабліва эфектыўныя на дзярнова-карбанатных, вапнавых дзярнова-падзолістых глебах, карбанатных чарназёмах, шэразёмах і інш. з нейтральнай і шчолачнай рэакцыяй глебавага раствору. Найб. успрымальныя да Ц.у. пладовыя культуры і гародніна, цукр. буракі, бавоўнік, кукуруза.

ЦЫНКАГРА́ФІЯ (ад *цынк* + *...графія*), спосаб вырабу рэльефных друкарскіх форм высокага друку (*клішэ*) з дапамогай фотахім. працэсаў.

Негатыў (дыяпазітыў) відарыса капіруюць на пакрытую святлоадчувальным слоем цынкавую (часам медную або латунную) пласціну, паверхню якой потым апрацоўваюць траўленнем кіслатой у прагальных участках выявы для атрымання рэльефных друкавальных элементаў. Пры электраграві́раванні растравых і штрыхавых клішэ выкарыстоўваюць электронна-мех. гравіравальныя аўтаматы. Спосаб Ц. прапанаваны ў 1850 Ф.Жыло (Францыя), удасканалены ў 1862 Г.Джэймсам (Вялікабрытанія). Спосаб электраграві́равання з'явіўся ў 1950-я г. Ц. наз. таксама адпаведны ўчастак або цэх паліграф. прадпрыемства.

ЦЫНКЕРНА́ГЕЛЬ (Zinkernagel) Рольф (н. 6.1.1944, г. Базель, Швейцарыя), швейцарскі вучоны ў галіне імуналогіі. Замежны чл. Амер. нац. АН (1996), Аўстрал. АН (1996), Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1998), Лонданскага каралеўскага т-ва (1998). Скончыў Базельскі ун-т (1968), дзе і працаваў. З 1971 у Лазанскім ун-це. З 1973 у Аўстрал. ун-це (Канбера). З 1975 у клініцы мед. даследаванняў г. Ла-Джола (ЗША). З 1979 у Цюрыхскім ун-це, з 1992 дырэктар Ін-та эксперым. імуналогіі ў Цюрыху. Навук. працы па механізмах імуналагічнай талерантнасці, памяці, распазнавання клеткамі імуннай сістэмы мікробаў і малекул уласнага арганізма. Вызначыў ролю лімфацытаў (кілераў) у абароне ад вірусаў, антыцел у клетачным імунным адказе пры аўтаімунных рэакцыях у запаленчых працэсах. Нобелеўская прэмія 1996 (з П.Дохерці). *В.Ф.Ермакоў.*

ЦЫНКЛІДО́ТУС (Cinclidotus), род брыевых імхоў сям. цынклідотавых. 10 відаў. Пашыраны ў Еўразіі, Паўн. Амерыцы, Новай Зеландыі. На Беларусі 1 від — Ц. дунайскі (C. danubicus), занесены ў Чырв. кнігу. Трапляецца на даламітавых парогах у рэчышчах рэк.

Двухдомныя водныя лістасцябловыя расліны выш. 2—20 см. Сцябло галінастае, прымацаванае да субстрату *рызоідамі*. Лісце прамаадыходнае, прадаўгавата-ланцэтнае. Спарагоніі звычайна на кароткіх бакавых галінках, зрэдку на верхавінцы сцябла. Каробачка прамастойная, на кароткай ножцы. Каўпачок конусападобны, гладкі.

Цынклідотус дунайскі.

ЦЫНКЛІ́ДЫУМ (Cinclidium), род брыевых імхоў сям. мніевых. 6 відаў. Пашыраны ў арктычных і субарктычных шыротах і высакагор'ях Паўн. паўшар'я. На Беларусі 1 від — Ц. стыгійскі (C. stygium), занесены ў Чырв. кнігу. Трапляецца на багнавых балотах, па берагах азёр.

Шматгадовыя балотныя імхі. Утвараюць цёмна-зялёныя або часцей чырванавата-бурыя ці чарнаватыя, густалямцавыя дзярнінкі. Сцёблы прамастойныя, простыя, рыхла абліснелыя. Лісце, сабранае ў невял. разетку на верхавінцы генератыўнага сцябла, суцэльнакрайняе, ад акруглага да шырокалопасцевага. Каробачка павіслая, шарападобная, эліпсоідная. Каўпачок клабукападобны.

Цынклідыум стыгійскі.

ЦЫ́НКУ АКСІ́Д, хімічнае злучэнне *цынку* з кісларо́дам, ZnO. У прыро́дзе рэдкі мінера́л цынкі́т.

Бясколерныя крышталі, шчыльн. 5700 кг/м^3. Пры награванні не плавіцца (узганяецца пры 1800 °С). Амфатэрны (гл. *Амфатэрнасць*). Атрымліваюць спальваннем пары цынку ў паветры, а таксама пры абпале прыро́днага сульфі́ду цынку. Выкарыстоўваюць як белы пігме́нт для фарбаў (гл. *Бялілы*), акты́ватар вулканізацыі і напаўня́льнік у гумавай прам-сці; кампане́нт касме́тычных (крэм, пудра) і лек. сродкаў (мазі, пасты і інш.), зубных цэмента́ў і інш. Ядавіты; ГДК у атм. паветры 0,05 мг/м^3. *А.П.Чарнякова.*

ЦЫ́НКУ ЗЛУЧЭ́ННІ, хімічныя злучэнні, у састаў якіх уваходзіць *цынк* у ступені акіслення +2. Найб. шырока выкарыстоўваюць *цынку аксід*, а таксама сульфа́т $ZnSO_4$, сульфі́д ZnS і хлары́д $ZnCl_2$.

Цынку сульфат — бясколерныя крышталі, растваральныя ў вадзе. З раствораў крышталізуецца гептагідра́т $ZnSO_4 \cdot 7H_2O$ — цынкавы купарва́с (у прыро́дзе мінера́л гаслары́т). Атрымліваюць узаемадзе́яннем цынку або яго аксіду з сернай к-той. Выкарыстоўваюць у выт-сці віскозы, як мікраўгна́енне, кампане́нт электраліту пры атрыма́нні цынку электролізам і цынкава́ннем, пратраву пры фарбава́нні тканін, адбе́львальнік паперы і інш. Цынку сульфід — бясколерныя крышталі; не растваральныя ў вадзе, растваральныя ў мінер. к-тах. У прыро́дзе мінера́лы *сфалерыт* і *вюрцыт*. Выкарыстоўваюць сінт. ZnS як люмінафо́р для экранаў электронна-прамянёвых і рэнтгенаўскіх трубак, кампане́нт *літапо́ну*, паўправадні́коваы матэрыя́л.

Цынку хларыд — бясколерныя, вельмі гіграскапі́чныя крышталі, добра растваральныя ў вадзе. Выкарыстоўваюць як антысе́птык для драўніны, кампане́нт травільных раство́раў і інш. *А.П.Чарнякова.*

ЦЫНЛУ́Н, Цанлун, у кітайскай міфало́гіі дух-сімвал Усхо́ду, якога стараж. кітайцы асацыя́равалі з вясно́й. Яго з'яўленне лічылася шчаслі́вым прадве́сцем. Выява Ц. ў выглядзе дракона колеру зялёнай весна́вой травы мела сэнс добрага пажада́ння, яе часта змяшчалі на ваен. сцягах. У сярэ́днія вякі Ц. шанава́лі як духа-ахоўніка дзвярэ́й.

ЦЫНХА́Й, возера ў Кітаі; другая назва воз. *Кукунор*.

ЦЫНХА́Й, правінцыя на ПнЗ Кітая. Пл. 720 тыс. км^2. Нас. 5,23 млн. ж. (2001). Адм. ц. — г. *Сінін*. У рэльефе пераважаюць горы і пласкагор'і. Цайдамская катлавіна (выш. 2,6—3,1 тыс. м) абмежавана на Пн гарамі Наньшань (выш. 5—6 тыс. м) і Алтынтаг, на Пд — гарамі Куньлуня (выш. да 6—7 тыс. м); на Пд ч. Тыбецкага нагор'я. Клімат рэзка кантынента́льны. Ападкаў 300—500 мм за год. На Ц. вярхоўі рэк Янцзы, Хуанхэ, Мекóнг. Шмат азёр, найб. — Кукунор. Горныя стэпы і паўпустыні. Ц. — слаба развіты аграрны рэгіён Кітая. Пераважае адгонная жывёлагадоўля. Гадуюць авечак, коз, коней, буйн. раг. жывёлу (у т.л. тыбецкіх якаў), аслоў, мулаў, вярблюдаў. У рачных далінах земляро́бства. Вырошчваюць холадаўстойлівыя гатункі пшаніцы, ячменю, авёс, чумізу, кукурузу, рапс, бульбу. Здабыча нафты, вугалю, каменнай і азёрнай солі, слюды, свінцовых і цынкавых руд. Прам-сць: нафтаперапр., металургія, машынабудаванне, харч., пераважна мясная і мясакансервавая. Транспарт аўтамаб. (Цынхай-Тыбецкая аўтамаб. дарога) і чыгуначны.

ЦЫНХО́НА, род кветкавых раслін, тое, што *хіннае дрэва*.

ЦЫНЦА́ДЗЕ Сулхан Фёдаравіч (н. 23.8.1925, г. Горы, Грузія), грузінскі кампазітар. Нар. арт. Грузіі (1961). Нар. арт. СССР (1988). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1950, кл. С.*Казалупава*; 1953, кл. С.Багатырова). З 1963 выкладае ў Тбіліскай кансерваторыі (у 1965—84 рэктар, з 1973 праф.). Зрабіў значны ўклад у развіццё груз. камерна-інстр. музыкі. Сярод твораў: оперы «Залатое руно» (1952), «Пустэльнік» (паст. 1972); балеты «Дэман» (паст. 1961), «Рыварэс» (паст. 1982); аперэты, араторыі, кантаты, 5 сімфоній (1952—85), канцэрты для інструментаў з аркестрам; камерна-інстр. ансамблі; рамансы, песні; музыка для драм. т-ра і кіно. Дзярж. прэмія СССР 1950. Дзярж. прэміі Грузіі 1974, 1981.

Літ.: Мсехишвили Э. С.Цинцадзе. М., 1970.

ЦЫНЦЫНА́ТЫ (Cincinnati), горад на ПнУ ЗША, штат Агайо. Засн. ў 1788. 331 тыс. ж. (2000), з прыгарадамі 1,7 млн. ж. Порт на р. Агайо. Трансп. вузел. Буйны прамысл., гандлёва-фін. і культ. цэнтр. Прам-сць: суднабудаванне, маш.-буд., металаапр., эл.-тэхн. і радыёэлектронная, хім. (выт-сць мыла і мыйных сродкаў, касметыкі, медыкаментаў), харчасмакавая (мясная, мукамольная, піваварная), паліграф., мэблевая, папяровая. Выт-сць авіяц. рухавікоў і ракет, быт. машын і прылад.

ЦЫНЬ, старажытнакітайскае царства. Узнікла каля 10 ст. да н.э. Першапачаткова залежала ад дынастыі *Чжоў*. Яго тэрыторыя ўключала зах. і паўн.-зах. часткі сучаснай прав. Шэньсі, усх. ч. Ганьсу і Пн Сычуані. У перыяд *Чжаньго* (5—3 ст. да н.э.) была адной з 7 магутных дзяржаў Кітая. Узмацненне Ц. звязана з рэформамі *Шан Яна*. У сярэдзіне 4 ст. да н.э. пачало барацьбу супраць інш. царстваў і да 221 да н.э. падпарадкавала іх, стварыўшы цэнтралізаваную імперыю Ц. Заснавальнік імперыі — Цынь Шыхуандзі (259—210 да н.э.), правіцель царства Ц. [246—221 да н.э.] і імператар [221—210 да н.э.]. Пры ім дзяржава падзелена на 36 адм. акруг, уніфікавана пісьменнасць, створана адзіная сістэма мер і вагаў, пачалося будаўніцтва (у 215 да н.э.) *Вялікай кітайскай сцяны*. У 212 да н.э. жорстка расправіўся з канфуцыянцамі. Узмацненне падатковага ціску і няспынныя войны выклікалі нар. паўстанні пад кіраўніцтвам Чэнь Шэна, У Гуана, *Лю Бана* і інш. У 207 да н.э. войска Лю Бана захапіла сталіцу Сяньян, дынастыя Ц. спыніла існаванне.

Літ.: Переломов Л.С. Империя Цинь — первое централизованное государство в Китае (221—202 гг. до н.э.). М., 1962.

ЦЫНЬЛІ́Н, горны хрыбет у Кітаі, з У прымыкае да Куньлуня, утварае водападзел бас. рэк Янцзы і Хуанхэ. Даўж. каля 1000 км. Выш. да 3666 м. Складзены пераважна з вапнякоў і крышт. сланцаў, моцна расчлянёны, на У падзяляецца на 4 адгор'і. Рэзкі прыродны рубеж паміж вечназялёнымі субтрапічнымі лясамі (бамбук, камелііі, магноліі) на паўд. схілах і сухімі стэпамі і лістападнымі лясамі ўмеранага пояса на паўночных. Некалькі рэзерватаў (Тайбайшань, Фапін-Юэба і інш.). Радовішча малібдэнавых руд.

ЦЫНЬХУАНДА́О, горад у паўн. ч. Кітая, прав. Хэбэй. 365 тыс. ж. (1990). Незамярзаючы порт у Ляадунскім зал. Жоўтага м. (вываз вугалю і нафты). Прам-сць: шкляная, чорная металургія, маш.-буд., хім., цэментавая. Канцавы пункт нафтаправода Дацын—Ц.

ЦЫНЬ ШЫХУАНДЗІ́, Цынь Шыхуан, Ін Чжэн (259—210 да н.э.), правіцель царства Цынь [246—221 да н.э.], першы імператар Кітая [221—210 да н.э.]. Гл. ў арт. *Цынь*.

ЦЫ́ПКІН Барыс Навумавіч (12.9.1896, Мінск — 3.3.1961), бел. артапед-траўматолаг. Д-р мед. н. (1936), праф. (1949). Скончыў Маскоўскі ун-т (1922). З 1930 у Бел. ін-це фізіятрыі, артапедыі і неўралогіі. З 1941 у эвакашпіталях г. Уфа. З 1945 у Бел. НДІ траўматалогіі і артапедыі (нам. дырэктара), адначасова (1950—54) у Бел. ін-це ўдасканалення ўрачоў (заг. кафедры). Навук. працы па лячэнні хвароб і пашкоджанняў касцей, касцявых пухлін.

Тв.: Вучэнне аб скрыўленнях хрыбетніка (скаліёзы, кіфозы, лардозы). Мн., 1932; Клиника, диагностика и лечение костных опухолей. Мн., 1961 (у сааўт.).

ЦЫПО́ЛА Гізела Альбертаўна (н. 27.9.1944, с. Гаць Закарпацкай вобл., Украіна), украінская спявачка (лірыка-драм. сапрана). Нар. арт. Украіны (1976). Нар. арт. СССР (1988). Скончыла Харкаўскі ін-т мастацтваў (1969). З 1968 салістка Укр. т-ра оперы і балета.

Сярод партый: Марыльца («Тарас Бульба» М.Лысенкі), Аксана («Запарожац за Дунаем» С.Гулак-Арцямоўскага), Таццяна, Ліза («Яўген Анегін», «Пікавая дама» П.Чайкоўскага), Чыо-Чыо-сан, Тоска («Чыо-Чыо-сан», «Тоска» Дж.Пучыні), Этэры («Абесалом і Этэры» З.Паліяшвілі) і інш. Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу вакалістаў імя М.Глінкі (1968), Міжнар. конкурсу «Мадам Батэрфляй» (Токіо, 1976; 1-я прэмія). Дзярж. прэмія Грузіі 1972.

ЦЫРК (ад лац. circus круг), 1) від сцэнічнага мастацтва, адным з асн. сродкаў выразнасці якога з'яўляецца трук. 2) Спецыяльны будынак з манежам (*арэнай*), у якім даюцца цыркавыя прадстаўленні.

Цыркавое мастацтва ўключае акрабатыку (гл. *Акрабатычнае мастацтва*), *эквілібрыстыку, жанглiраванне*, ілюзіянізм *клаунаду, дрэсіроўку* жывёл, муз. *эксцэнтрыку* і інш. Яго вытокі ў нар. абрадах і гульнях, у творчасці скамарохаў, балаганных і кірмашовых т-рах. Элементы сучаснага цыркавога мастацтва сустракаліся ў Стараж. Кітаі, Грэцыі, Рыме, Візантыі. Паказы адбываліся ў спец. будынках — амфітэатрах і складаліся са спарт. гульняў, баёў гладыятараў, выступленняў жанглёраў, канатаходцаў. Вялікую ролю ў развіцці цыркавога мастацтва адыгралі жанглёры (у Францыі), шпільманы (у Германіі), франты (у Польшчы), дарвозы і масхарабозы (у Сярэдняй Азіі). У 1772 Ф.Астлей адкрыў у Лондане школу верхавой язды, у 1782 пабудаваў першы ў свеце стацыянарны Ц. У Расіі першы стацыянарны будынак з'явіўся ў Пецярбургу (1827). У 1880 адкрыты *Маскоўскі цырк* (з 1997 імя Ю.*Нікуліна*). Для падрыхтоўкі артыстаў Ц. пры імператарскім тэатр. вучылішчы існавала цыркавое аддзяленне. У 1926 у Маскве арганізавана майстэрня цыркавога мастацтва (з 1961 Дзярж. вучылішча цыркавога і эстр. мастацтва). Рэжысёраў Ц. рыхтуюць у Рас. акадэміі тэатр. мастацтва. Найб. вядомыя рас. цыркавыя артысты: клоуны Л.*Енгібараў, Карандаш* (М.Румянцаў), В.Лазарэнка, Нікулін, А.*Папоў*, дрэсіроўшчыкі жывёл І.*Бугрымава*, Ю.*Куклачоў*, В.*Філатаў*, П.Круцікаў, П.Крылоў, Я.Панкратаў, дынастыі *Валжанскіх, Дуравых, Запаш-*

Да арт. **Цырк**. Арэна цырка Ф.Астлея. Лондан.

Да арт. **Цырк**. Акрабаты пад кіраўніцтвам А.Ампадзістава.

Да арт. **Цырк**. Дрэсіроўшчыца А.Выгарніцкая з ламамі. 2003.

Да арт. **Цырк**. Эквілібрыст С.Загорскі. 2003.

ных, Канціміравых, ілюзіяністы *Кіо*, гімнасты Каўрыгіны, наезнік П.Федасееўскі, акрабаты Вінкіны, Сосіны, канатаходзец Ф.Маладцоў, барцы І.Заікін, П.Крылоў, І.Паддубны і інш.

На Беларусі элементы цыркавога мастацтва былі ў творчасці скамарохаў (вядомы з пропаведзі Кірылы Тураўскага супраць скамароства, 12 ст.). З 17 ст. ствараліся спец. школы дрэсіроўкі мядзведзяў (гл. «*Смаргонская акадэмія*»), вяровачных скакуноў і штукароў (у в. Семежава Капыльскага р-на Мінскай вобл.). У 1-й пал. 19 ст. існаваў Ц. памешчыка Л.Оштарпа ў в. Дукора Пухавіцкага р-на Мінскай вобл., дзе выступалі замежныя і прыгонныя штукары і блазны (вядомы бел. фокуснік Даўгяла). У 19 ст. ў часовых памяшканнях, балаганах і манежах мясц. знаці адбываліся гастролі замежных труп. У 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. ў Мінску гастраліравалі перасоўныя летнія Ц. К.Гіне, Годфруа, Чынізелі, Труцы, Фероні, у Гомелі — трупы К.Муміно, А.Дэвінье, Далай-Ламы, А.Лапіяда, Ц. «Рускі калізей» Ф.Дурава. У 1884 у Мінску адкрыўся першы зімовы стацыянарны «Рускі цырк братоў Нікіціных», у 1890-я г. — Ц. у Гомелі (існаваў да 1917). У 1926 адкрыўся новы Гомельскі Ц. (у 1932 будынак перададзены БДТ-3). У 1930-я г. ў мінскім гар. парку працаваў летні Ц., з 1947 — шапіто. У 1959 прэм'ерай праграмы *Беларускага цыркавога калектыву* (існаваў да 1974) адкрыўся зімовы стацыянарны будынак *Мінскага цырка*. Сярод паказаў у Мінскім Ц. — нумары «Паветранае адажыо» (1985), «Паветраная гімнастка» (1998), «Акрабатычны дуэт» (1999), «Дрэсіраваныя мядзведзі» (2003), спектаклі «Збройнік Праспера» (1985), «Заўсёды свята» (1992), «Вясёлы Рымша» (1994), «Карлсан у цырку» (1999), «Планета радасці» (2000), «Айбаліт-2001» (2001), «Маскарад» (2002), «Зімовая казка» (2003), атракцыён «Ілюзія» (2003). У 1950—60-я г. ў Гомелі працавала шапіто. У 1972 адкрыўся другі на Беларусі стацыянарны *Гомельскі цырк*. Сярод пастановак у ім: нумары «Дрэсіраваныя кошкі» (1986), «Лялька» (1987), «Акрабаты на шастах», «Танцы на дроце» (абодва 1992), «Конь-матэматык», «Вышэйшая школа верхавой язды» (абодва 1993), «Акрабатычная пара», «Ёга» (абодва 1994), «Гульня з хула-хупамі» (1996), атракцыён «Мядзведзі на конях» (1993). Значны ўклад у развіццё цыркавога мастацтва на Беларусі зрабілі артысты і дзеячы культуры К. і Ю. Аўерыно, Т. і Г. Бандарчукі, А.*Варанецкі*, А.Ваўчок, А.*Вязаў*, Ф.*Гулевіч*, К.Дароці, М.Запашная, Б.*Кабішчар*, В.Колабаў, Я.Лабовіч, У.Макараў, М.*Марусалаў*, П.Мар'янкоў, Я.*Мілаеў*, Л. і А. Пасечнікі, В.Пацехін, В.Радзянка, Б.Райскі, М.Фінберг, Я.Чахаўскі, А.*Шаг-Наважылаў*, акрабаты Сунгуравы, турністы пад кіраўніцтвам В.Кашубы і інш. З 1998 пры Мінскім муз. вучылішчы імя М.Глінкі працуе аддз. па падрыхтоўцы артыстаў Ц. З 1950-х г. працуюць аматарскія цыркавыя калектывы, некаторыя з іх маюць званне народных.

Літ.: Весь вечер на манеже. М., 1965; Кузнецов Е. Цирк. 2 изд. М., 1971; Шляпин Л.Ф. Цирк любителей. М., 1976; Фальковский А.П. Художник в цирке. М., 1978; Вадимов А.А., Тривас М.А. От магов древности до иллюзионистов наших дней. 2 изд. М., 1979; Лабада А. Цырк на беларускай арэне: Фотаальбом. Мн., 1989.

Т.М.Бандарчук, Я.М.Лабовіч.

Да арт. **Цырк**. Клоун А.Родзін.

ЦЫРК у геамарфалогіі, увагнутая (крэслападобная) форма рэльефу ў гарах. Адрозніваюць ледавіковыя Ц. — *кары* і апоўзневыя Ц. — катлавіны, якія ўтварыліся ў выніку апоўзняў на стромкіх схілах, складзеных з пластычных парод.

ЦЫРКО́Н (ням. Zirkon ад перс. заргун — залацісты), мінерал падкласа астраўных сілікатаў, сілікат *цырконію*, $Zr[SiO_4]$. Мае да 67,1% ZrO_2, прымесі да 24% HfO_2 (альвіт); да 16% Y_2O_3 і Ce_2O_3 (хагаталіт); Ta_2O_5 і Hb_2O_5 (наэгіт); U_3O_8, ThO_2 (малакон, цырталіт) і інш. Крышталізуецца ў тэтраганальнай сінганіі. Утварае доўга- і кароткапрызматычныя або дыпірамідальныя крышталі, зросткі з інш. мінераламі, крыжападобныя двайнікі і інш.

Колер саламяна-жоўты (жаргон), пурпурна-чырвоны (гіяцынт), бясколерны (матура-алмаз), ярка блакітны (штучна афарбаваны старліт), шэры, радзей зялёны. Бляск алмазны да шклянога. Празрысты. Цв. 7,5. Шчыльн. 4—4,7 г/см^3. Крохкі. Малаконы і цырталіты радыеактыўныя. Пашыраны акцэсорны мінерал магматычных і метамарфічных парод, трапляецца ў россыпах. Руда на цырконій, гафній і іх злучэнні. Выкарыстоўваецца ў ювелірнай справе, ліцейнай (фармовачныя пяскі) і вогнетрывалай керамічнай вытв-сцях. Радовішчы ў Расіі, Нарвегіі, Бразіліі, Аўстраліі, ЗША, Шры-Ланцы і інш.

ЦЫРКО́НІЙ (лац. Zirconium), Zr, хімічны элемент IV групы перыяд. сістэмы, ат.н. 40, ат.м. 91,224. Прыродны Ц. — сумесь 5 стабільных нуклідаў з масавымі лікамі 90—92,94 і 96, найб. пашыраны ^{90}Zr (51,46%). У зямной кары прыблізна $2 \cdot 10^{-2}$% па масе. Упершыню вылучаны ў 1789 ням. хімікам М.Г.Клапратам у выглядзе дыаксіду з мінералу *цыркону* (адсюль назва).

Бліскучы серабрыста-шэры метал. Існуе ў 2 крышт. мадыфікацыях: гексаганальнай α-Zr і кубічнай β-Zr. Шчыльн. 6510,7 кг/м^3, $t_{пл}$ 1855 °С. Кампактны Ц. пры пакаёвай т-ры вельмі каразійнаўстойлівы, што абумоўлена ўтварэннем тонкай трывалай плёнкі *цырконію дыаксіду*. Устойлівы да ўздзеяння мінер. к-т і шчолачаў. Пры награванні раствараецца ў плавікавай і канцэнтравай сернай к-тах, царскай гарэлцы; узаемадзейнічае з галагенамі (утварае тэтрагалагеніды), азотам і інш. неметаламі. Атрымліваюць пры перапрацоўцы асн. мінералаў — цыркону і *бадэлеіту*. Выкарыстоўваюць як канстр. матэрыял у ядз. энергетыцы, кампанент сплаваў для вырабу хім. апаратаў, хірург. інструментаў і інш.

А.П.Чарнякова.

ЦЫРКО́НІЮ ДЫАКСІ́Д, злучэнне *цырконію* з кіслародам, ZrO_2. У прыродзе — мінерал *бадэлеіт*.

Бясколерныя крышталі, $t_{пл}$ 2700 °С. Не раствараецца ў вадзе і к-тах, раствараецца ў канцэнтраванай сернай к-це. Пры награванні рэагуе з аксідамі, гідраксідамі, карбанатамі 1- і 2-валентных металаў. Атрымліваюць гартаваннем гідраксідаў цырконію або яго тэрмічна няўстойлівых солей, напр., нітратаў. Прамежкавы прадукт пры атрыманні цырконію. Выкарыстоўваюць як кампанент керамікі, эмалей, спец. шкла, лазерных матэрыялаў; цвёрды электраліт, п'езаэлектрык. Сінт. монакрышталі Ц.д. — імітатар брыльянтаў (фіяніт).

ЦЫ́РКУЛЬ (лац. Circinus), сузор'е Паўд. паўшар'я неба. Найб. яркая зорка 3,2 візуальнай *зорнай велічыні*. З тэр. Беларусі не відаць. Гл. *Зорнае неба*.

ЦЫ́РКУЛЬ (ад лац. circulus круг, акружнасць), 1) чарцёжны або вымяральны інструмент для вычэрчвання акружнасцей і іх дуг, лінейных вымярэнняў і пераносу памераў, а таксама для кратнага павелічэння або памяншэння адрэзкаў. Адрозніваюць Ц. разметачны (гл. *Разметка*), дзялільны, кругавы, прапарцыянальны, штангенцыркуль (гл. *Штангенінструмент*, *Чарцёжна-кан-*



Эліптычны **цыркуль**: *a*, *b* — паўвосі эліпса; *M* — муфта; *B* — шарнір (муфта і шарнір замацоўваюцца так, каб *AM* = *a* і *BM* = *b*).

структарская тэхніка). 2) Ц. эліптычны, эліпсограф — інструмент для вычэрчвання эліпсаў.

ЦЫРКУЛЯ́Р (ням. Zirkular ад лац. circularis кругавы), пісьмовае распараджэнне дзярж. ці грамадскага органа або тлумачэнне аб парадку прымянення якога-н. прававога акта; рассылаецца падведамным установам, арг-цыям або падначаленым службовым асобам. У міжнар. праве існуе паняцце «цыркулярная нота» — афіц. дыпламат. пісьмовы зварот аднаго ўрада адначасова да некалькіх дзяржаў.

ЦЫРКУЛЯ́РНЫ ПСІХО́З, псіхічнае захворванне; тое, што *маніякальна-дэпрэсіўны псіхоз*.

ЦЫРКУЛЯ́ЦЫЯ АТМАСФЕ́РЫ, агульная цыркуляцыя атмасферы, планетарная сістэма паветраных плыняў над зямным шарам, у выніку якой ажыццяўляецца абмен *паветраных мас* у гарыз. і верт. напрамках, найб. важны кліматаўтваральны працэс, які забяспечвае цепла- і вільгацезварот на Зямлі, вызначае характар надвор'я. Ц.а. абумоўлена нераўнамерным размеркаваннем т-ры паветра і атм. ціску, адхіляючай сілай вярчэння Зямлі (*Карыяліса сіла*) і трэннем. У трапасферы да ўстойлівых паветр. плыней належаць *пасаты, мусоны*, паветраныя плыні, звязаныя з *цыклонамі* і *антыцыклонамі, мясцовыя вятры*; у верхняй трапасферы і ніжняй стратасферы — *струменныя плыні*. Над зямным шарам сфарміраваліся 3 цыркуляцыйныя сістэмы ўсх. плыняў (трапічная і 2 палярныя) і 2 сістэмы зах. плыняў умераных шырот. Для ўмераных і палярных шырот характэрна актыўная цыкланічная дзейнасць, якая развіваецца на арктычным і ўмераным франтах. Трапічныя шыроты ахоплены ўстойлівымі ўсх. плынямі — пасатамі, што рухаюцца ад тропікаў з высокім атм. ціскам да экватара з нізкім атм. ціскам. На ўсх. узбярэжжы мацерыкоў і ўнутры тропікаў узнікае мусонная цыркуляцыя — сезонныя плыні, якія змяняюць напрамак на супрацьлеглы — ад зімы да лета і наадварот. У межах агульнай Ц.а. ўзнікаюць мясц. вятры: *брызы*, горна-далінныя, *бара, фён* і інш. Тэр. Беларусі знаходзіцца пад пераважным уплывам *заходняга пераносу паветраных мас* умераных шырот.

П.А.Каўрыга.

ЦЫРКУМФЛЕ́КС (ад лац. accentus circumflexus аблегчаны націск), 1) у стараж.-грэч. мове адзін з відаў танічнага націску з узыходна-сыходным характарам. 2) Асаблівы тып складовай інтанацыі з узыходным характарам, які ўласцівы праслав. мове, некат. гаворкам шведскай мовы, сучаснай літ. мове. 3) У некат. мовах надрадковыя знакі для пазначэння даўжыні галосных (напр., франц. pale «закрыццё», pâle «бледны»).

Літ.: Тронский И.М. Древнегреческое ударение. М.; Л., 1962; Иллич-Свитыч В.М. Именная акцентуация в балтийском и славянском: Судьба акцентуационных парадигм. М., 1963; Зализняк А.А. От праславянской акцентуации к русской. М., 1985.

А.Я.Міхневіч.

ЦЫРКУ́Н Іван Іванавіч (н. 28.10.1950, в. Навасёлкі Дзяржынскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны-педагог. Д-р пед. н. (1999), праф. (2000). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1971). З 1976 у Бел. пед. ун-це (з 1985 заг. кафедры). Заснавальнік навук. школы і новага кірунку ў галіне інавацыйнай педагогікі — мадэліраванне і арганізацыя інавацыйнай прафес. адукацыі. Навук. працы па праблемах дыдактыкі фізікі, пед. інаватыкі, тэорыі і методыкі прафес. адукацыі і пед. навукі, выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі на Беларусі.

Тв.: Инновационная культура учителя-предметника. Мн., 1996; Методическая инноватика. Мн., 1996; Культурно-праксиологическая концепция специальной инновационной подготовки студентов педвуза // Вестн. Междунар. акад. наук высшей школы. 1999. №3 (9); Система инновационной подготовки специалистов гуманитарной сферы. Мн., 2000; Проблемы развития педагогической науки в Беларуси: Концептуальное обоснование и проектно-программные ориентиры // Адукацыя і выхаванне. 2002. №8.

ЦЫРКУНО́Ў Аляксандр Іванавіч (н. 28.3.1948, в. Лясань Жлобінскага р-на Гомельскай вобл.), бел. мастак. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1976). Творы вылучаюцца экспрэсіўнасцю, лаканізмам вобразнай структуры, разнастайнасцю тэхн. прыёмаў, тонкімі каларыстычнымі вырашэннямі: сюжэтна-тэматычныя карціны «Гусляр» (1980), «Вяселле ў Капылі» (1982), «Бульба», «Роспач. Двое», «У чаканні» (усе 1984), «Памяці У.Караткевіча» (1985), «Хрост ліцьвінаў» (1987), «Поступ», «Дзяды» (абедзве 1988), «Покліч» (1994), «Плашчаніца» (2000), «Жыццядайная крыніца» (2002); трыпціхі «На досвітку» (1981), «Свята (1988), «Адвечнае святло Беларусі» (1998); партрэты «Веткаўчанін Ф.Шкляраў» (1976), «Першадрукар Ф.Скарына» (1984), «Вяртанне з нябыту», «Граф М.Валовіч» (абодва 1988), «Прысвячэнне В.Быкаву» (1990), «Зорачкі. С.Новік-Пяюн» (1991), «Гісторык М.Ермаловіч» (2001), «Я.Колас у Верхмені», «Я.Купала. На кущцю» (абодва 2002), «Вітаўт Вялікі» (2003); пейзажы «Вострая брама» (1985), «На Палессі» (1988), «А ні канца, а ні пачатку» (1998); нацюрморты «Бабуліна спадчына» (1975), «Белая мелодыя» (1985) і інш.

Л.Ф.Салавей.

ЦЫРКУНО́Ў Рыгор Арцем'евіч (н. 4.12.1921, в. Сава Горацкага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне кіравання працэсамі перавозак на чыг. транспарце. Д-р тэхн. н. (1994), праф. (1997). Скончыў Маскоўскі ін-т інжынераў чыг. транспарту (1947). З 1956 у Бел. ун-це транспарту (у 1961—62 дэкан ф-та). Навук. працы па ўдасканаленні тэхналогіі работы і тэхн. аснашчэння перагрузачных станцый, перавозачнага працэсу хуткапсавальных грузаў. Распрацаваў нарматыўныя дакументы па тэхнал. працэсах работы чыг. вузлоў многіх станцый Беларусі і СНД.

Тв.: Организация работы станций перегруза. М., 1957; Взаимодействие и механизация процессов на станциях перегруза. Мн., 1962.

ЦЫРКУНО́Ў Уладзімір Максімавіч (н. 2.3.1953, г.п. Целяханы Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне інфекц. хвароб. Д-р мед. н., праф. (1992). Скончыў Гродзенскі мед. ін-т (1979), дзе і працуе (з 1990 заг. кафедры). Гал. гепатолаг Мін-ва аховы здароўя Беларусі. Навук. працы па інфекц. хваробах, прафілакт. імунізацыі.

А.Цыркуноў. Поступ. 1988.

Тв.: Практика инфекциониста. 2 изд. Мн., 1994 (разам з У.С.Васільевым, В.І.Комарам); Немедикаментозное лечение инфекционных больных. Мн., 1996 (з імі ж).

ЦЫРО́З (ад грэч. kirros рыжы, лімоннажоўты), разрастанне злучальнай тканкі ва ўнутр. органах (печані, нырках, лёгкіх і інш.). Суправаджаецца дэфармацыяй (ушчыльненнем) і парушэннем функцый органаў. З'яўляецца зыходам *некрозу*, запалення, дыстрафіі і атрафіі, якія звязаны з дзеяннем розных пашкоджвальных фактараў, расстройствам кровазвароту, парушэннем абменных працэсаў і інш. Часцей бывае *цыроз печані*. Ц. выклікае функцыян. недастатковасць органа. Прыводзіць да ўтварэння дабраякасных і злаякасных пухлін.

І.М.Семяненя.

ЦЫРО́З ПЕ́ЧАНІ, хранічнае захворванне *печані* чалавека і жывёл, якое прагрэсіруе. Характарызуецца разрастаннем злучальнай тканкі ў печані, яе ўшчыльненнем, зменай аб'ёму (павелічэнне або памяншэнне), пашкоджаннем усіх яе структурных элементаў. У ч а л а в е к а развіццё Ц.п. адбываецца пры інфекц. пашкоджаннях печані, спадчынных хваробах абмену рэчываў, уздзеянні таксічных рэчываў (лекі, алкаголь, прамысл. і быт. яды), застоі вянознай крыві і жоўці ў печані і інш. Найб. частая прычына — *гепатыт інфекцыйны*. Прыкметы: боль у вобласці печані, зніжаны апетыт, моташнасць, ірвота, гарката ў роце, насавы і страўнікавы крывацёк, жаўтавата-шэры колер скуры і інш. Лячэнне тэрапеўт., хірург. (уключае трансплантацыю печані). У ж ы в ё л Ц.п. часта развіваецца ў выніку гліснай інвазіі (напр., *дыкрацэліёз, фасцыялёзы*). Вядзе да схуднення, анеміі і гібелі ад інтаксікацыі. *І.М.Семяненя.*

ЦЫРУ́БІН Дзмітрый Малахавіч (н. 15.5.1916, в. Цітаўка Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.), Герой Сав. Саюза (1945). Удзельнік сав.-фінл. вайны 1939—40. У Вял. Айч. вайну на фронце з чэрв. 1941. Удзельнік бітваў на Дняпры, Сталінградскай, Курскай; Бабруйскай і Мінскай аперацый 1944, вызвалення Польшчы. Камандзір танк. батальёна маёр Ц. вызначыўся ў баі за плацдарм на р. Нараў. Яго батальён адзін з першых фарсіраваў раку, на плацдарме адбіў контратаку праціўніка, знішчыў 4 танкі і каля 120 аўтаматчыкаў. Асабіста Ц. знішчыў 2 процітанк. гарматы. Да 1957 у Сав. Арміі, да 1978 на адм. рабоце.

ЦЫРЦЭ́Я, К і р к а, у старажытнагрэчаскай міфалогіі німфа-чараўніца. Лічылася дачкой *Геліяса*, жыла ў раскошным палацы сярод лясоў в-ва Эя. Калі на востраў трапіў *Адысей*, Ц. ператварыла яго спадарожнікаў у свіней, а яго самога цэлы год трымала каля сябе. Адысей хітрасцю пераадолеў чары Ц. і прымусіў яе зноў ператварыць яго спадарожнікаў у людзей, пасля чаго пакінуў з імі востраў. Ад сувязі Адысея з Ц. нарадзіўся сын Тэлегон, які пазней выпадкова забіў не пазнанага ім бацьку.

Дз.М.Цырубін.

ЦЫРЫМАНІ́ЯЛ (лац. caerimoniale кніга абрадавых правіл), распарадак правядзення *цырымоній*.

ЦЫРЫМО́НІЯ (лац. caerimonia пашана, павага), прыняты парадак правядзення якога-н. абраду, урачыстасці. У пераносным значэнні Ц. — якое-н. працяглае дзеянне, што здзяйсняецца паслядоўна і метадычна; умоўнасці ў паводзінах, уласцівыя цырымоннаму чалавеку, манернасць.

ЦЫ́РЫН, вёска ў Карэліцкім р-не Гродзенскай вобл., на правым беразе р. Сэрвач. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 24 км на Пд ад г.п. Карэлічы, 213 км ад Гродна, 36 км ад чыг. ст. Гарадзея. 576 ж., 232 двары (2003). Прадпрыемствы «Ніка» і «Цырын», цэх па вытв-сці пластмасавых вырабаў. Сярэдняя школа-сад, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Свята-Міхайлаўская царква. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

Вядома з 1432 як шляхецкае, потым дзярж. ўладанне. З пач. 16 ст. мястэчка ў Навагрудскім пав. З канца 16 ст. ў Ц. праводзіліся пав. сеймікі, існавала царква. У 1670 у мястэчку 62 дымы, вадзяны млын. З 1718 уласнасць Несялоўскіх, 68 дымоў. 26.11.1718 атрымала ад вял. князя Аўгуста II прывілей на штотыднёвыя таргі і 6 кірмашоў у год. У 17 ст., верагодна, мела магдэбургскае права. Кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі 5.6.1792 пацвердзіў магдэбургскае права і герб: у блакітным полі алень з залатым крыжам паміж рагамі. Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) у складзе Рас. імперыі, 395 ж., 75 двароў. З 1842 цэнтр воласці Навагрудскага пав. Мінскай губ. У 1852 пабудавана Спаса-Праабражэнская царква, у 1862 адкрыта прыходская школа. У 1880 у мястэчку 610 ж., 94 двары; у 1897 — 718 ж., 129 двароў, нар. вучылішча, вадзяны млын, царква, 2 капліцы, яўр. малітоўны дом, багадзельня, хлебазапасны магазін, 3 крамы, карчма; двойчы на год праводзіліся кірмашы. З 1921 у складзе Польшчы, цэнтр гміны Навагрудскага пав., 274 ж., 50 двароў. З 1939 у БССР, з 12.10.1940 вёска, цэнтр сельсавета. З 25.11.1940 у Карэліцкім р-не Баранавіцкай, з 8.1.1954 Гродзенскай вобл., з 25.12.1962 да 6.1.1965 у Навагрудскім р-не.

У.У.Бянько (гісторыя).

ЦЫРЭЛЬЧУ́К Мікалай Андрэевіч (н. 14.7.1946, в. Адрыжын Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне мікраэлектронікі. Канд. тэхн. н. (1986), праф. (1998). Засл. работнік нар. адукацыі Беларусі (1991). Скончыў Мінскі радыётэхн. ін-т (1967), дзе і працаваў. З 1985 рэктар Мінскага вышэйшага радыётэхн. каледжа. Навук. працы па стварэнні элементнай базы электронных сродкаў і праектаванні спец. устройстваў на яе аснове, па праблемах прафес. і інжынерна-пед. адукацыі. Аўтар падручнікаў і навуч. дапаможнікаў для ВНУ.

Тв.: Конструирование и технология производства ЭВМ. Мн., 1996 (разам з М.І.Пікулем, І.М.Русаком); Приборы с зарядовой связью, управляемые р-п-переходами для однокристальных микросхем. Мн., 1997; Инженерно-педагогическое образование на современном этапе развития профессиональной школы. Мн., 2001. *А.І.Болсун.*

ЦЫСІ́, Ц ы С і (29.11.1835—15.11.1908), маньчжурская імператрыца, якой фактычна належала ўлада і ў Кітаі ў 1861—1908. З маньчжурскага роду Нара. Была наложніцай імператара Сяньфына, а пасля нараджэння сына — наследніка прастола — стала яго другой жонкай. Рэгентша ў 1861—73 і 1875—1889. Супрацьстаяла спробам прагрэс. рэформ, што вяло да эканам. адставання Кітая і яго закабалення імперыял. дзяржавамі. У 1898 у выніку дварцовага пераварота (гл. *«Сто дзён рэформ»*) зноў сканцэнтравала ў сваіх руках усю ўладу.

Літ.: С е м а н о в В.И. Из жизни императрицы Цыси, 1835—1908. М.,1976.



Цысоіда.

ЦЫСЛЕЙТА́НІЯ (ням. Cisleitanien, чэш. Cislajtanie, Předlitavsko), пашыраная назва часткі тэр. Аўстра-Венгерскай імперыі (1867—1918) на З ад р. Лейта. Разам з уласна Аўстрыяй уключала Чэхію, Маравію, Сілезію, Галіцыю, Істрыю, Крайну, Карынтыю, Букавіну, Далмацыю і шэраг інш. абласцей. Тэр. на У ад Лейты называлася *Транслейтанія*.

ЦЫСО́ІДА, плоская крывая, геаметрычнае месца пунктаў *M* пучка прамых з цэнтрам *O* на акружнасці, для якіх $OM = PQ$. *P* і *Q* — пункты перасячэння

прамой *OM* адпаведна з акружнасцю і датычнай *t*, праведзенай да акружнасці ў пункце, дыяметральна процілеглым пункту *O*.

Ураўненне Ц. ў дэкартавых каардынатах: $y^2 = x^3/(a-x)$, у палярных: $\rho = a \sin^2\varphi/\cos\varphi$. Пачатак каардынат *O* з'яўляецца *асаблівым пунктам* — пунктам звароту, прамая $x = a$ — асімптотай. Плошча паміж Ц. і асімптотай $S = 3\pi a^2/4$.

ЦЫ́СТА (ад грэч. kystis пузыр), часовая форма існавання многіх прасцейшых, водарасцей і некаторых мікраскапічных шматклетачных арганізмаў. Характарызуецца наяўнасцю ахоўнай абалонкі. Выпрацавалася ў працэсе прыстасавання арганізмаў да неспрыяльных умоў асяроддзя. У прасцейшых адрозніваюць Ц. спакою (з тоўстымі абалонкамі; могуць існаваць некалькі гадоў) і размнажэння (з тонкай абалонкай; утвараюцца на кароткі перыяд).

ЦЫСТАЗЕ́ЙРА, цыстазіра (Cystoseira), род цыкласпоравых водарасцей. 60 відаў. Пашыраны пераважна ў морах паўн. субтрапічнага пояса. Утвараюць зараснікі да глыб. 25 м.

Слаявіна шматгадовая ў выглядзе буйных кустоў, выш. да 2 м (радзей 8). Да грунту прымацоўваецца дыскам, падэшвай або *рызоідамі*. Галіны цыліндрычныя ці пляскатыя, часта з паветранымі пузырамі. Размнажэнне палавое, *аагоніі* з 1 яйцаклеткай. З Ц. атрымліваюць *альгінавыя кіслоты* і іх солі (альгінаты), якія выкарыстоўваюць у фармацэўтычнай, тэкст. і харч. прам-сці. *Т.М.Міхеева.*

ЦЫСТАІДЭ́І, марскія пузыры (Cystoidea), клас вымерлых беспазваночных тыпу ігласкурых. Жылі ў морах у ардовіку (магчыма, у кембрыі) — дэвоне. 2 атр., каля 40 родаў. Прымацоўваліся да дна або ляжалі на ім. На Беларусі рэшткі Ц. пашыраны на ПдЗ і ПнЗ у адкладах пераважна сярэдняга ардовіку. Па рэштках Ц. вызначаюць узрост геал. адкладаў.

Цела складалася з шара-, яйца- ці грушападобнай чашачкі і сцябла (у прымацаваных форм). Чашачка ўтваралася шматлікімі шматвугольнымі таблічкамі, трывала змацаванымі і пранізанымі порамі складаная будовы; мела нешматлікія прыдаткі — брахіёлы.

ЦЫСТРО́Н (англ. cistron), частка малекулы ДНК, якая мае пэўную паслядоўнасць *нуклеатыдаў*; функцыян. адзінка спадчыннай інфармацыі. Тэрмін увёў амер. генетык С.Бензер разам з тэрмінам *рэкон* (1957). Паняцці «Ц.» і «ген» — сэнсавыя сінонімы.

ЦЫСТЫ́Н, дысульфід *цыстэіна*, заменная серазмяшчальная *амінакіслата*, 3,3-дытыобіс-2-амінапрапіёнавая кіслата, $[HOOC—CH(NH_2)—CH_2S]_2$. У саставе многіх бялкоў і пептыдаў (у кератыне валасоў разам з *цыстэінам* да 18%), у невял. колькасці прысутнічае ў клетках усіх жывых арганізмаў.

Бясколерныя крышталі, мал. м. 240,3, $t_{пл}$ 247—249 °С, дрэнна растваральцца ў вадзе, растваральцца ў мінер. к-тах і водных растворах шчолачаў. За кошт Ц. ў малекулах бялкоў утвараюцца папярочныя дысульфідныя сувязі, якія забяспечваюць іх фізіял. актыўнасць. Біял. роля Ц. тоесная цыстэіну і ўтвараецца з яго. Можа ператварацца ў піравінаградную к-ту (ацэтыл-КоА). Генетычна абумоўленыя парушэнні абмену Ц. прыводзяць да спадчыннай хваробы цыстынозу. *І.М.Семяненя.*

ЦЫСТЫ́Т (ад грэч. kystis пузыр), запаленне слізістай абалонкі мачавога пузыра. Адрозніваюць востры і хранічны, ачаговы і дыфузны, першасны і другасны (ускладненне інш. захворванняў мачавога пузыра, нырак, маткі і інш.), таксама інфекц. (найб. часты) і неінфекц. (напр., лекавы, траўматычны).

Узнікненню Ц. садзейнічаюць пераахаладжэнне, ператамленне, застой мачы пры *адэноме прастаты* і інш. Прыкметы вострага Ц.: частае балючае мочаспусканне, лейкацыты ў мачы (пры цяжкіх Ц. — дамешкі гною і крыві). Хранічны Ц. бывае першасны, як вынік вострага, прыкметы выяўлены слабей, бываюць перыяд. абвастрэнні. Ускладненні: *перфарацыя* мачавога пузыра, *піеланефрыт*. Лячэнне тэрапеўт., зрэдку хірургічнае.

І.М.Семяненя.

ЦЫСТЫЦЭ́РК (ад грэч. kystis пузыр + kerkos хвост), разнавіднасць лічынкі стужачных чарвей — *фіны*. Характэрна развіццё адной галоўкі з прысоскамі і кручкамі, укручанай у поласць пузыра. Развіваецца ў арганізме прамежкавага гаспадара — свінні, буйн. раг. жывёлы, зрэдку чалавека, выклікае *цыстыцэркозы*. У арганізме канчатковага гаспадара (напр., чалавека) ператвараецца ў дарослага чарвяка.

ЦЫСТЫЦЭРКО́З, хвароба, выкліканая паразітаваннем у тканках жывёл і чалавека *цыстыцэрка*, адзін з *гельмінтозаў*. У чалавека ўзбуджальнік Ц. — лічынка свінога цэпня. Заражэнне праз харч. прадукты і ваду, якія забруджаны яйцамі паразітаў. З крывёю і лімфай лічынкі распаўсюджваюцца па арганізме. Узбуджальнік паразітуе ў розных органах, часцей у галаўным мозгу і ў воку. Лячэнне тэрапеўтычнае. У жывёл на Ц. хварэюць дробная і буйн. раг. жывёла, коні, свінні, сабакі, ваўкі, некаторыя віды грызуноў (прамежкавыя гаспадары).

ЦЫСТЫЦЭРКО́ІД (ад грэч. kystis пузыр + kerkos хвост + eidos выгляд), разнавіднасць лічынкі стужачных чарвей — *фіны*. Цела падзелена на тулава і хвост, галоўка з прысоскамі ўкручана ўнутр тулава. Паразітуюць у поласці цела прамежкавага гаспадара (кольчатых чарвей, ракападобных, насякомых, малюскаў ці пазваночных жывёл). У арганізме канчатковага гаспадара (сабакі, ката) ператвараецца ў дарослага чарвяка.

ЦЫСТЭІ́Н, L-α-аміна-β-меркаптапрапіёнавая кіслата, заменная серазмяшчальная *амінакіслата*, $H_2S—CH_2—CH(NH_2)—COOH$. У саставе многіх прыродных бялкоў і пептыдаў прысутнічае ў клетках усіх жывых арганізмаў. У арганізме чалавека і жывёл утвараецца з *метыяніну* і *серыну*, таксама шляхам аднаўлення *цыстыну*; у раслінах — з серыну і сульфідаў; у мікраарганізмах — з ацэтылсерыну і сераводароду.

Крышт. рэчыва, мал. м. 121,16; добра растваральцца ў вадзе, аміяку, этаноле, воцатнай к-це. Лёгка акісляецца на паветры. Уваходзіць у састаў актыўных цэнтраў многіх ферментаў, забяспечвае антыаксідантную ахову арганізма. З Ц. ўтвараецца амінакіслата таўрын (яе выкарыстоўваюць для сінтэзу парных жоўцевых к-т), піравінаградная к-та і інш. Пры распадзе Ц. ў кішэчніку ўтвараюцца сераводарод і метылмеркаптан. Выкарыстоўваецца ў медыцыне. *І.М.Семяненя.*

ЦЫСТЭ́РНА (лац. cisterna вадаём, вадасховішча), штучнае закрытае збудаванне (ёмістасць) для захоўвання або транспарціроўкі вадкасцей, звадкаваных газаў, сыпкіх прадуктаў.

Перасоўныя Ц. манціруюць на рамах аўтамабіляў, прычэпах, чыг. цялежках. Аўтамабілі-Ц. бываюць для перавозкі нафтапрадуктаў, цэменту, харч. прадуктаў (малако, піва, мука і інш.), звадкаваных газаў (прапан, бутан, кісларод і інш.), хім. рэчываў (кіслоты, шчолачы); ёмістасць да 15 м³. Ц. тэсла-прычэпы выкарыстоўваюцца ў асн. для перавозкі сіласных кармоў, вадкіх угнаенняў, інш. с.-г. грузаў; ёмістасць да 50 м³. Стацыянарныя Ц. — бетонныя, жалезабетонныя або метал. ёмістасці і рэзервуары. Бываюць падземныя, заглыбленыя і наземныя (на фундаментах, спец. эстакадах). Ц. абсталёўваюцца прыладамі для кантролю за станам прадукту, вымярэння ўзроўню або расходу, прыстасаваннямі для запаўнення і зліву.

В.М.Кандрацьеў.

Цыстэрны: 1 — паўпрычапная да седлавога цягача для перавозкі сіласнага корму (ФРГ); 2 — каток-цыстэрна АТ «Амкадор» для прыгатавання і транспарціроўкі суспензій для стабілізацыі адхонаў.

ЦЫСТЭРЦЫЯ́НЦЫ, члены каталіцкага манаскага ордэна, засн. ў 1098 бенедыктынцам Раберам Малемскім. Назва ад першага манастыра ордэна — Цыстэрцыум (каля г. Дыжон, Францыя). У 1115 узначаліў Бернар Клервоскі. Статут ордэна 1119 прадпісваў фіз. працу,

аскетычны лад жыцця. У 12—13 ст. мужчынскія і жаночыя манастыры Ц. былі багатыя, уплывовыя і шматлікія (да 1300 існавала каля 700 іх манастыроў у многіх краінах). У 14 ст. кангрэгацыя Ц. заняпала. З Ц. вылучыліся *бернардзінцы* і трапісты. У наш час налічваецца каля 3 тыс. Ц.

...ЦЫТ, ЦЫТА... (ад грэч. kytos ёмішча, клетка), часткі складаных слоў, якія паказваюць на іх адносіны да жывёльных або расл. клетак (напр., *цытакінез, цыталогія; трамбацыты, эрытрацыты*).

ЦЫТАГЕНЕ́ТЫКА (ад *цыта...* + *генетыка*), навука, што вывучае заканамернасці спадчыннасці і зменлівасці ва ўзаемасувязі з будовай і функцыямі ўнутрыклетачных структур (пераважна *храмасом*).

Тэарэт. фундамент Ц. — асн. палажэнні *храмасомнай тэорыі спадчыннасці*, сфармуляванай у пач. 20 ст. Т.Х.*Морганам* і яго школай. У станаўленні Ц. як самаст. навукі значную ролю адыгралі працы вучоных Р.А.Лявіцкага і І.Д.Чысцякова (Расія), К.Белара, Т.*Бовери*, О.Гертвіга, Э.*Страсбургера*, В.*Флемінга* (Германія), У.Сетана (ЗША), фундаментальныя распрацоўкі Б.Л.*Астаурава*, М.К.*Кольцова*, С.Г.*Навашыным*, Г.Д.Карпечанкі, А.А.Пракоф'евай-Бяльгоўскай. Выкарыстанне ў Ц. электроннай мікраскапіі, радыёаўтаграфіі, рэнтгеналструктурнага аналізу, дыферэнцыяльнай афарбоўкі храмасом і інш. спрыяла выяўленню тонкай структуры храмасом і асаблівасцей іх функцыянавання ў працэсах рэплікацыі, транскрыпцыі і трансляцыі. Адрозніваюць агульную Ц. (клетачныя асновы спадчыннасці) і Ц. раслін, жывёл і чалавека. Даныя Ц. выкарыстоўваюцца ў вывучэнні працэсаў відаўтварэння, медыцыне, селекцыі раслін і жывёл.

На Беларусі даследаванні па Ц. (разам з *цыталогіяй*) пачаліся ў 1920-я г. ў БДУ (П.А.*Маўрадыядзі*). Асн. навук. цэнтры: Ін-т генетыкі і цыталогіі Нац. АН Беларусі, НДІ анкалогіі і мед. радыялогіі, НДІ спадчынных і прыроджаных захворванняў, Н.-д. клінічны ін-т радыяцыйнай медыцыны і эндакрыналогіі, БДУ, Мінскі і Віцебскі мед. ун-ты, Гродзенскі мед. ін-т, БСГА. Уклад у развіццё Ц. зрабілі У.Я.*Борматаў*, А.Р.*Жэбрак*, А.У.*Канстанцінаў*, А.А.*Кедраў-Зіхман*, Г.В.*Краскоўскі*, Г.І.*Лазюк*, Г.М.*Палілава*, Л.У.*Хатылёва*. Даследуюцца структурна-функцыян. арганізацыя геномаў раслін, тэарэт. і метадычныя аспекты эксперым. ператварэння карыятыпаў раслін метадамі храмасомнай інжынерыі, праблемы лячэння спадчынных хвароб і пухліннага росту, цытагенет. эфекты ўздзеяння іанізавальных выпрамяненняў і хім. фактараў у саматычных і палавых клетках.

Літ.: Константинов А.В. Цитогенетика. Мн., 1971; Тетраплоидные тритикале: Создание, цитогенетич. изучение и использование в селекции. Мн., 1990; Наука Беларуси в XX столетии. Мн., 2001. *Н.І.Дубавец.*

ЦЫТАДЫЯГНО́СТЫКА (ад *цыта...* + *дыягностыка*) у медыцыне, распазнаванне захворванняў і даследаванне фізіял. стану арганізма чалавека на аснове вывучэння клетачных элементаў і цытахім. рэакцый. Выкарыстоўваецца ў *анкалогіі* (напр., распазнаванне злаякасных і дабраякасных пухлін), *гематалогіі* (дыягностыка захворванняў і ацэнка эфектыўнасці іх лячэння), *гінекалогіі* (выяўленне цяжарнасці, гарманальных парушэнняў і інш.), для распазнавання многіх хвароб органаў дыхання, страваванне, нерв. сістэмы і інш. Часта спалучаюць з гісталагічным даследаваннем.

ЦЫТАДЭ́ЛЬ (ад італьян. citadella літар. — маленькі горад), 1) найб. умацаваная цэнтр. ч. горада або крэпасці, разлічаная на самаст. абарону ў выпадку разбурэння вонкавых фартыфікацыйных збудаванняў; апошні пункт абаронцаў пры штурме. Ц. ўзніклі ў гарадах Стараж. Егіпта, Месапатаміі і інш. Гіст. назвы — *акропаль* (Стараж. Грэцыя), *капітолій* (Стараж. Рым). На Беларусі Ц. былі *дзядзінцы*, пазней *астрогі*. З 13—14 ст. ролю Ц. выконвалі замкі і вежы-данжоны (гл. *Камянецкая вежа, Тураўская вежа*). Ц. складаліся з абарончых збудаванняў розных тыпаў і канструкцый (умацаваныя драўляныя тыны, равы, валы, муры, вежы і інш.), дзе размяшчаліся адм. і культавыя пабудовы, жылі князь з дружынай і інш. Часцей іх будавалі на натуральных або штучных узвышшах, на лініі крапасных сцен, унутры горада (крэпасці) ці за іх межамі. Ц. мелі абароннае значэнне да пач. 20 ст. (гл. *Бабруйская крэпасць, Брэсцкая крэпасць*). 2) Унутраны аб'ём карабля (да 3/4 яго даўжыні), абмежаваны бранявымі паясамі, пераборкамі (траверзамі) і палубай, для размяшчэння жыццёва важных часцей (машынных і кацельных аддзяленняў, боезапасаў і інш.). 3) У пераносным значэнні Ц. — гал. апорны пункт (цэнтр) якой-н. арг-цыі, цвярдыня, крэпасць, апора.

ЦЫТАЗІ́Н, 2-оксі-4-амінапірымідзін, пірымідзінавая азоцістая аснова. Змяшчаецца ва ўсіх жывых арганізмах у саставе *нуклеінавых кіслот* (ДНК і РНК).

Крышт. рэчыва белага колеру, $t_{пл}$ ~ 320° С, добра растваральнае ў шчолачах, дрэнна ў халоднай вадзе; слабая аснова. Малекула Ц. мае плоскую канфігурацыю. У ДНК утварае за кошт 3 вадародных сувязей камплементарную пару з *гуанінам*. Вядомы мінорныя асновы Ц. — 5-метылцытазін (выяўлены ў саставе ДНК вышэйшых раслін і некаторых бактэрый) і 5-оксіметылцытазін (у некаторых штамах фагаў кішэчнай палачкі). Выходныя рэчывы для біясінтэзу Ц. — аспарагінавая к-та і карбамаілфасфат, які сінтэзуецца з двухвокісу вугляроду і аміяку з удзелам АТФ.

І.М.Семяненя.

ЦЫТАКІНЕ́З (ад *цыта...* + грэч. kinēsis рух), цытатомія, раздзяленне цела мацярынскай клеткі на 2 даччыныя ў заключнай фазе *(тэлафазе)* дзялення клеткі і яе ядра. Тыповае, але не абавязковае завяршэнне *мітозу*. У большасці раслін Ц. адбываецца шляхам утварэння ўнутрыклетачнай перагародкі, у клетках жывёл і некат. раслін — клетачнай перацяжкі.

Плоскасць Ц. звычайна супадае з экватарыяльнай плоскасцю *верацяна дзялення*. Множныя мітозы часта не суправаджаюцца Ц., а ўтвараюцца гіганцкія мнагаядзерныя клеткі (сімпласты) у клетках эндасперму многіх вышэйшых раслін, плазмодыях міксаміцэтаў, папярочнапаласатых мышачных валокнах. Вынік ацытакінезу — двух'ядзерныя клеткі, звычайныя ў многіх органах, напр., у печані і інш. вял. залозах млекакормячых жывёл.

ЦЫТАКІНІ́НЫ (ад *цыта...* + *кініны*), гармоны раслін, вытворныя 6-амінапурыну. Маюцца ў раслінах у выглядзе свабодных асноў, рыбазідаў і рыбатыдаў. Сінтэзуюцца пераважна ў *мерыстэме* кораня, рухаюцца ў складзе *пасакі* ў парасткі, удзельнічаюць у рэгуляцыі абмену рэчываў у надземных органах, стымулююць сінтэз РНК і бялку ў адчувальных да іх аб'ектах. У прысутнасці *аўксіну* выклікаюць дзяленне клетак, дыферэнцыроўку сцёблавых пупышак у *калусаў*, актывізуюць рост клетак лісця, затрымліваюць старэнне зрэзанага лісця травяністых раслін, выклікаюць адкрыццё вусцейкаў і інш.

У кветкавых раслінах выяўлены ва ўсіх частках, найб. — у мерыстэмах. Асн. прыродныя Ц. — зеацін, дэгідразеацін, ізапентэніладэнін. Іх сінт. аналагі выкарыстоўваюцца пры даследаванні асаблівасцей ўздзеяння Ц. на расліны і з практычнымі мэтамі (напр., для атрымання расады каштоўных кветак і агароднінных культур метадам культуры тканак).

ЦЫТАЛО́ГІЯ (ад *цыта...* + *...логія*), навука пра *клетку*. Вывучае будову і функцыі тканкавых клетак у мнагаклетачных арганізмаў, аднаклетачныя арганізмы і ядзерна-цытаплазматычныя комплексы, не падзеленыя на клеткі (сімпласты, сінцытыі, плазмодыі). Клетка — асн. структурна-функцыян. адзінка жывога, таму працэсы і заканамернасці, што даследуе Ц., — аснова працэсаў, якія вывучае гісталогія, анатомія, эмбрыялогія, фізіялогія, генетыка, біяхімія, малекулярная біялогія і інш. У шэрагу раздзелаў Ц. — карыясістэматыка, радыяцыйная Ц., імунацыталогія, цытапаталогія, клетачная інжынерыя і інш.

Вывучэнне клетак з дапамогай мікраскопа пачалося ў 2-й пал. 17 ст. (Р.*Гук*, А.*Левенгук*, М.*Мальпігі*). Адно з найважн. дасягненняў — стварэнне *клетачнай тэорыі* (1839). Удасканаленне мікраскопа прывяло ў 2-й пал. 19 ст. да адкрыцця арганоідаў цытаплазмы і ролі ядра ў працэсе мітатычнага дзялення клеткі. Даследаванні ролі храмасом у спадчыннасці і вызначэнні полу далі ў пач. 20 ст. пачатак *цытагенетыцы*. З 1950-х г. развіццё Ц. звязана з выкарыстаннем электроннага мікраскопа, метадаў колькаснай цытахіміі, культывавання тканкавых клетак па-за арганізмам і інш.

На Беларусі даследаванні па Ц. пачаліся ў 1920-я г. ў БДУ (П.А.*Маўрадыядзі*). Асн. цэнтры: Ін-т генетыкі і цыталогіі Нац. АН Беларусі, НДІ анкалогіі і мед. радыялогіі, НДІ спадчынных і прыроджаных захворванняў, БДУ, Мінскі і Віцебскі мед. ун-ты, Гродзенскі мед. ін-т, Гомельскі ун-т, Віцебская

акадэмія вет. медыцыны, Горацкая с.-г. акадэмія. Вывучаюцца агульныя заканамернасці арганізацыі клетачных структур і ўнутрыклетачных працэсаў, унутрыклетачных рэгулятарных механізмаў цэласнай клеткі, механізмы рэалізацыі генет. інфармацыі на розных этапах антагенезу і інш.

Літ.: Морфогенез и структура органов человека и животных. Мн., 1970; Заварзин А.А. Основы частной цитологии и сравнительной гистологии многоклеточных животных. Л., 1976; Ченцов Ю.С. Общая цитология. 2 изд. М., 1984; Збарский И.Б., Кузьмина С.Н. Скелетные структуры клеточного ядра. М., 1991. *А.С.Леанцюк.*

ЦЫТАПАТАЛО́ГІЯ (ад *цыта...* + *патало́гія*), клетачная патало́гія, тэорыя *медыцыны*, засн. на вучэнні Р.*Вірхава* аб клетцы як матэрыяльным субстраце хваробы (1855—58). Недаацэньвала арганізм як цэласную сістэму, але садзейнічала развіццю медыцыны: вывучэнню марфал. змен у арганізме пры хваробах, высвятленню іх *патагенезу*, паляпшэнню *дыягностыкі*. Наступныя дасягненні навукі дазволілі пераадолець памылковыя палажэнні Ц. і сінтэзаваць з яе ўсё карыснае.

ЦЫТАПЛА́ЗМА (ад *цыта...* + *плазма*), абавязковая частка *клеткі*, якая знаходзіцца паміж плазматычнай мембранай і ядром; высокаўпарадкаваная мнагафазная калоідная сістэма — гіялаплазма з размешчанымі ў ёй *арганоідамі*. Пранізана мікратрубачкамі, філаментамі і мікрафіламентамі.

У *эўкарыётаў* сукупнасць філаментаў і мікратрубачак утварае цыташкілет, які складае апорна-рухальную сістэму клеткі; з ім звязаны змена формы клеткі і перамяшчэнне ўнутрыклетачных структур. У Ц. адбываюцца ўсе працэсы клетачнага метабалізму, акрамя сінтэзу нуклеінавых кіслот, які здзяйсняецца ў клетачным ядры. Праз плазматычную мембрану ідзе абмен рэчываў паміж Ц. і навакольным асяроддзем, праз ядзерную — ядзерна-цытаплазматычны абмен. Пад кантролем ядра Ц. здольная да росту і ўзнаўлення, пры частковым выдаленні — поўнасцю рэгенерыруе, у бяз'ядзерных клетках — не здольная існаваць аўтаномна. Гл. таксама *Пратаплазма*. *А.С.Леанцюк.*

ЦЫТАПЛАЗМАТЫ́ЧНАЯ МЕМБРА́НА, тое, што *клетачная мембрана*.

ЦЫТА́ТА (ад лац. citatum ад citare заклікаць, прыводзіць), даслоўная вытрымка з якога-н. тэксту, прамовы. Выкарыстоўваецца для падмацавання пэўнай думкі аўтарытэтным выказваннем, як найб. дакладная паводле сэнсу яе фармулёўка, як фактычны ілюстрацыйны матэрыял, для крытыкі цытуемай думкі. У пісьмовай, пераважна навук. і афіц.-дзелавой, мове Ц. бяруць у двукоссі ці вылучаюць шрыфтам і даюць спасылку на крыніцу. Прапушчаныя словы ці сказы ў Ц. абазначаюць шматкроп'ем.

ЦЫТАХІ́МІЯ (ад *цыта...* + *хімія*), раздзел *цыталогіі*, што вывучае састаў клетачных структур, сінтэз, размеркаванне, функцыян. актыўнасць і змены хім. злучэнняў у *клетцы*. Як навука развіваецца з сярэдзіны 19 ст. Асн. прынцып метадаў Ц. — звязванне пэўнага хім. кампанента клеткі з фарбавальнікам або ўтварэнне афарбоўкі ў працэсе рэакцыі. Метадамі Ц. абгрунтавана генет. роля нуклеінавых кіслот, вызначана сувязь паміж функцыян. актыўнасцю клеткі і колькасцю бялкоў у ёй, адкрыты і вывучаны клетачны цыкл. Даследаванне метадамі Ц. тканкавых структур наз. *гістахіміяй*.

Літ.: Введение в количественную цитохимию: Пер. с англ. М., 1969; Луппа Х. Основы гистохимии: Пер. с нем. М., 1980. *А.С.Леанцюк.*

ЦЫТАХРО́МЫ (ад *цыта...* + *...хром*), складаныя бялкі — пераносчыкі электронаў, *прастэтычная група* якіх прадстаўлена *гемам*. Адкрыты ў 1886. Маюцца ў расл., жывёльных і бактэрыяльных клетках. Ажыццяўляюць ступеньчаты перанос электронаў ад арган. рэчываў, што акісляюцца, на малекулярны кісларод у акісляльна-аднаўленчых рэакцыях (за кошт змены валентнасці атама жалеза ў геме $Fe^{2+} \leftrightarrows Fe^{3+}$). Вылучаюць 4 яго асн. групы: *a, b, c* і *d*, якія адрозніваюцца бакавымі ланцугамі пры парфірынавых кольцах і бялковымі кампанентамі. Звязаны ў асн. з унутрыклетачнымі мембранамі (унутр. мембранай мітахондрый, мембранамі мікрасом і інш.). Удзельнічаюць у тканкавым дыханні, акісленні малекулярным кіслародам непалярных арган. злучэнняў.

Літ.: Березов Т.Т., Коровкин Б.Ф. Биологическая химия. 3 изд. М., 1998; Эллиот В., Эллиот Д. Биохимия и молекулярная биология: Пер. с англ. М., 2000. *І.М.Семяненя.*

ЦЫТВО́РА, фармацэўтычная назва нераскрытых суквецця́ў цытворнага (сантанінавага) *палыну*. У Ц. каля 2% сантаніну (глістагоннага сродку).

ЦЫТО́ВІЧ Іосіф Парфіравіч (1811 ? — 7.8.1870), бел. публіцыст і педагог. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю. З 1835 настаўнік моў у Віцебскім і Полацкім духоўных вучылішчах, з 1844 — у дваранскім вучылішчы і гімназіі, наглядчык пав. вучылішча ў Панявежы (цяпер г. Паневяжыс, Літва). У 1843 надрукаваў у пецярбургскім час. «Маяк» арт. «Словы два пра мову і пісьменнасць Белай Русі», дзе, згадваючы росквіт айчыннай кніжнасці ў часы Літоўскага статута і Ф.Скарыны, ставіў пытанне пра неабходнасць развіцця бел. л-ры, у якасці прыкладу «гнуткасці і паслухмянасці» бел. мовы апублікаваў верш «Чалом, чалом, ацец, татулька!..». У нарысе «Адзін дзень у Беларусі» (1845) падкрэсліваў каштоўнасць старажытн. бел. мовы для навукі, заклікаў да вывучэння гісторыі і фальклору Беларусі. Аўтар працы «Некалькі слоў адносна развіцця рускай мовы ў Жмудзі або Самагіціі» (1851, рукапіс зберагаецца ў архіве Рус. геагр. т-ва, С.-Пецярбург). У пытаннях грамадскага жыцця прытрымліваўся кансерватыўных поглядаў.

Тв.: У кн.: Пачынальнікі: З гіст.-літ. матэрыялаў XIX ст. Мн., 1977.

Літ.: Киселёв Г. Разыскивается классик... Мн., 1989. С. 61—67; Каўка А. Тут мой народ. Мн., 1989. С. 153—155. *Г.В.Кісялёў.*

ЦЫТО́ВІЧ Мікалай Аляксандравіч (26.5.1900, в. Міхнічы Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл. — 26.4.1984), расійскі вучоны ў галіне механікі грунтоў і інж. геалогіі; заснавальнік інж. мерзлатазнаўства (геакрыялогіі) і геамеханікі. Чл.-кар. АН СССР (1943). Герой Сац. Працы (1980). Засл. дз. нав. і тэхн. Расіі (1960). Скончыў Ленінградскі ін-т грамадз. інжынераў (1927), дзе і працаваў. З 1947 у Ін-це мерзлатазнаўства АН СССР у Маскве (нам. дырэктара). З 1952 у Маскоўскім інж.-буд. ін-це (заг. кафедры). Навук. працы па асновах буд-ва на шматгадовамёрзлых грунтах, асн. заканамернасцях агульнай механікі грунтоў, механікі мёрзлых грунтоў. Распрацаваў асновы прагрэс. метаду буд-ва ў ўмовах вечнай мерзлаты — з захаваннем мёрзлага стану грунтоў падножжа. Дзярж. прэмія СССР 1952.

М.А.**Цытовіч**.

Тв.: Основы механики грунтов. Л.; М., 1934; Механика мерзлых грунтов (общая и прикладная). М., 1973; Инженерный метод прогноза осадок фундаментов. М., 1988.

Літ.: Ухов С.Б., Цытович Г.Н. Н.А.Цытович — основоположник советской геомеханики. М., 1986; Малышев М.В. Н.А.Цытович // Архитектура и стр-во Москвы. 2000. № 5. *М.М.Касцюковіч.*

ЦЫТО́ВІЧ Мітрафан Феафанавіч (1869, Магілёўская губ. — 1936), бел. і расійскі вучоны ў галіне отарыналарынгалогіі. Д-р медыцыны (1907). Скончыў Пецярб. ваенна-мед. акадэмію (1895). У 1895—1904 ваен. ўрач у г. Магілёў. З 1908 у Пецярб. ваенна-мед. акадэміі. У 1914—30 у Саратаўскім ун-це (праф.). У 1930—36 дырэктар НДІ фізіялогіі верхніх дыхальных шляхоў і вуха ў Сараташе. Навук. працы па пытаннях прафілактыкі хвароб вуха, горла і носа. Апісаў поўны фістульны сімптом (проба Ц., 1912).

Тв.: Болезни уха, носа и горла. Саратов, 1922; Патогенез и терапия хронических заболеваний верхних дыхательных путей // Вестн. оториноларингологии. 1936. № 1.

ЦЫ́ТРА (ням. Zither ад грэч. kithara кіфара), струнны шчыпковы муз. інструмент. Мае плоскі драўляны корпус нак-

шталт скрынкі ў форме прамавугольніка з адным фігурна выразаным бокам; уздоўж другога боку змешчаны грыф з метал. ладамі, 4—5 метал. струн — меладычныя, астатнія (25—40) — жыльныя, нацягнуты па-за грыфам над дэкай і служаць для акампанементу. Пры ігры кладзецца на калені або на падстаўку. Гук здабываецца з дапамогай плектра, а таксама зашчыпваннем іх пальцамі.

Цытра.

Вядома са старажытнасці. Карысталася папулярнасцю ў Аўстрыі, Германіі (Баварыя), у 19 ст. існавалі суполкі, клубы, акадэміі цытрыстаў. Сярод яе разнавіднасцей: прыма, тэнар, альт, бас.

На Беларусі пашырылася ў 2-й пал. 19 ст. Бытавала сярод музыкантаў-аматараў. Выйшла з ужытку ў пач. 20 ст. У сялянскім муз. побыце выкарыстоўвалася самаробная Ц., канструкцыя якой спалучала элементы стараж.-рус. *гусляў* і зах.-еўрап. струнна-клавішных інструментаў. На Ц. ігралі на вяселлях, бяседах, ігрышчах (сола ці ў ансамблі са скрыпкай, цымбаламі) і для суправаджэння прыпевак. Сустракалася ў 1930-я г. ў Чэрвеньскім, Стаўбцоўскім (Мінская вобл.), Пастаўскім (Віцебская вобл.) і Навагрудскім (Гродзенская вобл.) р-нах.

І.Дз.Назіна.

ЦЫТРА́ЛЬ, арганічнае злучэнне, альдэгід тэрпенавага шэрагу $(CH_3)_2C=CHCH_2CH_2C(CH_3)=CHCHO$. Кампанент многіх эфірных алеяў (леманграсавага, лімоннага, эўкаліптавага і інш.).

Светла-жоўтая вадкасць з моцным лімонным пахам, $t_{кіп}$ 228—229°С, шчыльнасць 888—895 кг/м^3. Існуе ў выглядзе ізамераў — гераніялю і нералю. Растваральнасць ў этаноле і дыэтылавым эфіры. Рэакцыяздольнае рэчыва, на паветры хутка акісляецца. Атрымліваюць з эфірных алеяў і сінт. шляхам з ізапрэну, ацэтону і ацэтылену. Выкарыстоўваюць як кампанент харч. эсенцый, парфумерных кампазіцый, лек. сродкаў і інш.

ЦЫТРО́Н (Citrus medica), кветкавая расліна сям. рутавых. Вядомы толькі ў культуры ў краінах з трапічным і субтрапічным кліматам. Радзіма — Індыя і Кітай. Завезены ў Міжземнамор'е арміяй Аляксандра Македонскага за 300 г. да н.э., у Месапатаміі вядомы за 4 тыс. гадоў да н.э.

Вечназялёны куст або дрэва выш. да 3 м. Галіны з адзіночнымі пазушнымі калючкамі даўж. да 5 см. Лісце буйное, падоўжанаавальнае, шчыльнае. Кветкі белыя з чырванаватым адценнем, буйныя, адзіночныя або ў суквеццях. Лімонна-жоўтыя, радзей аранжавыя плады даўж. да 14 см, масай 1—2 кг, падобныя на вял. лімон, маюць кісла-салодкі, злёгку гаркаваты смак, ідуць на цукаты, мармелад, варэнне. З лісця, кветак і лупін атрымліваюць эфірны алей. Харч., тэхн., дэкар. расліны.

ЦЫТРУЛІ́Н, 2-аміна-5-урэідаваляр'янавая кіслата, амінакіслата, якая не ўваходзіць у састаў бялкоў. Упершыню выяўлены ў 1914 у соку кавуна (лац. назва Citrullis vulgaris — адсюль назва). Прысутнічае ў арганізме чалавека і жывёл, ёсць у раслінах і мікраарганізмах.

Малекулярная маса 175,19, $t_{пл}$ 222—234°С, растваральнасць ў вадзе, не растваральнасць ў этаноле і метаноле. Прамежкавы прадукт біясінтэзу *аргініну* і ўтварэння *мачавіны* ў арганізме. У раслін удзельнічае ў фіксацыі азоту.

І.М.Семяненя.

ЦЫ́ТРУС (Citrus), род кветкавых раслін сям. рутавых. Каля 15 відаў, большасць — культурныя, палепшаныя многавяковай селекцыяй дзікарослых форм, што цяпер не існуюць. Цэнтр узнікнення роду — Паўд. і Паўд.-Усх. Азія. У дзікім стане захаваліся некалькі відаў, у т.л. Ц. сапраўдны, або кіслы, ці лайм (C. aurantifolia), які расце ў Гімалаях, і танкан (C. tancan) — у лясах в-ва Тайвань. Віды Ц. культывуюць у вільготных тропіках і субтропіках. Вядомы *апельсін, грэйпфрут, лімон, мандарын, памяранец, цытрон*, бергамот, шэдак і інш. Для атрымання пладоў больш высокай якасці як прышчэпу выкарыстоўваюць *трыфаліяту*.

Вечназялёныя дрэвы, радзей кусты выш. 4—12 (20) м. Лісце ад яйцападобнага да ланцэтнага, у пазухах — калючкі. Кветкі двухполыя, духмяныя, звычайна ў шчыткападобных суквеццях. Плады (гесперыды) сакаўныя, са шчыльнай скуркай, у многіх відаў ядомыя, маюць лімонную к-ту, вітамін С (больш за 60 мг%), каравін, цукры і інш.; спажываюць у свежым і перапрацаваным выглядзе, разам з кветкамі выкарыстоўваюць у эфіраалейнай і харч. прам-сці; драўніна ідзе на дробныя вырабы.

ЦЫ́ТРУСАВЫЯ КУЛЬТУ́РЫ, група вечназялёных раслін роду *цытрус* сям. рутавых, якія вырошчваюць для атрымання пладоў. Каля 28 відаў: *апельсін, грэйпфрут, мандарын, лімон, цытрон*, бергамот, лайм, шэдак і інш. Пашыраны ў краінах Міжземнамор'я, Паўд. Азіі і Амерыкі, у т.л. ЗША, Кітаі, Японіі, Індыі, Пакістане, Аўстраліі. Плады Ц.к. вызначаюцца высокімі смакавымі якасцямі, маюць лімонную к-ту, цукры, вітаміны С, Р, групы В, каравін. Іх выкарыстоўваюць у свежым і перапрацаваным выглядзе (сок, варэнне, цукаты), у кулінарыі *(цэдра)*. З кветак, лісця і лупін атрымліваюць эфірныя алеі для парфумернай і харч. прам-сці.

Квітучая галінка і плод **цытрону**.

ЦЫТРЫ́Н (ад лац. citrinus лімонны), мінерал, разнавіднасць празрыстага *кварцу* жоўтага колеру. Дыхраічны, мяняе адценні жоўтага колеру (лімонны, мядовы, шафранавы, радзей залацістакарычневы). Утвараецца ў поласцях нізкатэмпературных кварцавых жыл і ў мяролавых пегматытах. Выкарыстоўваецца ў ювелірнай справе. Радовішчы рэдкія. Ц. трапляецца на в-ве Мадагаскар, в-ве Аран у Шатландыі, у Расіі, Бразіліі, Францыі. Штучныя ювелірныя Ц. наз. гольд-тапаз, мадэйра-тапаз, Рыо-Грандэ-тапаз і інш.; іх атрымліваюць абпальваннем *аметысту* або дымчатага кварцу, яны чырвоных адценняў, дыхраізм адсутнічае.

ЦЫХО́Н Антон Міхайлавіч (26.5.1887, в. Альшэўскія Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. — 7.3.1939), савецкі парт. і дзярж. дзеяч. Удзельнік Лют. і Кастр. рэвалюцый 1917 у Маскве, чл. Басманнага райкома РСДРП(б), ВРК; у 1917—28 старшыня Басманнага райсавета. У 1928—30 старшыня ЦК саюза будаўнікоў. У 1930—33 нарком працы СССР. З 1935 у Мінску, упаўнаважаны Камісіі сав. кантролю пры СНК СССР па Беларусі. У 1923—24 чл. ЦКК, у 1925—27 чл. Цэнтр. рэвіз. камісіі, у 1927—30 канд. у чл. ЦК ВКП(б), у 1930—34 чл. ЦК ВКП(б). Чл. ВЦВК СССР у 1919—37. 21.8.1938 беспадстаўна арыштаваны, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1954.

Э.А.Карніловіч.

ЦЫХУ́Н Генадзь Апанасавіч (н. 30.10.1936, в. Кунцаўшчына Гродзенскага р-на), бел. мовазнавец. Д-р філал. н. (1982). Скончыў Ленінградскі ун-т (1958). У 1958—59 і з 1963 у Ін-це мовазнаўства

Цытрын.

Нац. АН Беларусі (з 1990 заг. аддзела). Даследуе тыпалогію слав. моў і іх сувязі, моўныя саюзы, гаворкі Палесся, бел. этымалогію і гісторыю бел. мовазнаўчай славістыкі. Аўтар манаграфій «Сінтаксіс займеннікавых клітык у паўднёваславянскіх мовах» (1968), «Тыпалагічныя праблемы балканаславянскага моўнага арэалу» (1981), дакладаў на міжнар. з'ездах славістаў, артыкулаў пра бел.-паўднёваслав. і бел.-балг. сувязі і інш. Саўтар «Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы» (т. 1—8, 1978—93) і «Тураўскага слоўніка» (т. 1—5, 1982—87).

Тв.: Энкліза і пракліза ў структуры славянскага сказа. Мн., 1968; Тыпалогія сінтаксічных адрозненняў у балканаславянскім арэале. Мн., 1978; Арэальная тыпалогія славянскіх моў: Прынцыпы і напрамкі даслед. Мн., 1988; Арэальныя аспекты фарміравання славянскіх літаратурных моў. Мн., 1993; Славянскія мовы ў святле экалінгвістыкі. Мн., 1998; Міжславянскае моўнае ўзаемадзеянне (сацыякультурны аспект). Мн., 2003.

ЦЫЦА́НІЯ (Zizania), род кветкавых раслін сям. метлюжковых (злакавых). 2—3 віды. Пашыраны ў Паўн. Амерыцы і Усх. Азіі. На Беларусі інтрадукаваны 2 віды Ц.: вадзяная, або вадзяны, ці канадскі рыс (Z. aquatica) і шыракалістая (Z. latifolia). Вырошчваюць у вадаёмах рыбных і паляўнічых гаспадарак як кармавую расліну для рыб, вадаплаўных птушак, водных жывёл; часам дзічэюць.

Водныя адна- і шматгадовыя травяністыя расліны выш. да 3 м. Сцёблы тоўстыя, вузлаватыя, дыям. да 5 см. Лісце лінейнае, пляскатае. Суквецце (мяцёлка) даўж. да 50 см, верхняя частка якога мае несцікавыя, а ніжняя — тычынкавыя каласкі. Плод — зярняўка.

Дз.І.Трацяком.

ЦЫЦЫКА́Р, горад на ПнУ Кітая, на р. Нуньцзян, прав. Хэйлунцзян. 1,1 млн. ж. (1990). Буйны трансп. вузел. Прам-сць: маш.-буд. (прамысл. абсталяванне, станкі, трансп. сродкі), металургічная, дрэваапр., цэлюлозна-папяровая, мукамольная, цукр., харч.; вытв-сць аптычнага шкла.

ЦЫ́ЦЫН Мікалай Васілевіч (18.12.1898, г. Саратаў, Расія — 1980), расійскі батанік, генетык і селекцыянер. Акад. АН СССР (1939), акад. УАСГНІЛ (1938), Герой Сац. Працы (1968). Скончыў Саратаўскі ін-т сельскай гаспадаркі і меліярацыі (1927). Дырэктар Усесаюзнай с.-г. выстаўкі ў Маскве (1938—49 і 1954—57), НДІ збожжавай гаспадаркі нечарназёмнай паласы СССР (1940—49). З 1945 дырэктар Гал. бат. сада АН СССР, адначасова ў 1938—48 віцэ-прэзідэнт УАСГНІЛ. Навук. працы па пытаннях аддаленай гібрыдызацыі раслін. Стварыў новыя формы шматгадовай пшаніцы, гібрыдныя сарты азімай галінастай пшаніцы, пшанічна-пырнікавыя, жытне-пырнікавыя гібрыды з высокай ураджайнасцю і ўстойлівасцю да палягання.

Тв.: Проблема озимых и многолетних пшениц. М., 1935; Пути создания новых культурных растений. М., 1948; Отдаленная гибридизация растений. М., 1954; Новые — ветвистые разновидности мягких пшениц // Докл. АН СССР. 1961. Т. 136, №2; Роль отдаленной гибридизации в эволюции растений. М., 1975.

ЦЫЦЭ́РОН (Cicero) Марк Тулій (3.1.106 да н.э., Арпінум — 7.12.43 да н.э.), старажытнарымскі дзярж. і паліт. дзеяч, прамоўца, філосаф-асветнік, пісьменнік. З саслоўя *коннікаў*. З 63 да н.э. консул, пасля выкрыцця ім змовы *Катыліны* лідзіраваў у сенаце. У 58—57 да н.э. ў выгнанні. Пасля забойства *Цэзара* (44 да н.э.) зноў пачаў актыўную паліт. дзейнасць. Загінуў у час рэпрэсій М.*Антонія* і Актавіяна *Аўгуста*. Філас.

М.В.**Цыцын**.

Цыцэрон.

К.Э.**Цыялкоўскі**.



погляды Ц. склаліся пад уплывам ідэй розных філас. сістэм. Сваёй мэтай лічыў філас. асветніцтва рымлян: знаёміў грамадзян з рознымі вучэннямі і школамі, прывіваў ім любоў і павагу да мудрасці. Шмат увагі аддаваў тэарэт. распрацоўцы праблем маралі і маральнага ўдасканалення асобы («Аб межах дабра і зла», «Аб лёсе», «Аб абавязках», «Аб дружбе»). Абвяргаў вучэнні аб т.зв. вышэйшых дабрачыннасцях і рэкамендаваў кіравацца самой прыродай; крытычна ставіўся да прымхаў і ў той жа час абгрунтоўваў «чыста філасофскую» рэлігію («Аб прыродзе багоў»). Паліт. ідэал Ц. — дзяржава, якая спалучае ў сабе элементы манархіі, арыстакратыі і дэмакратыі, узорам якой ён лічыў Рым. рэспубліку 3 — пач. 2 ст. да н.э. Вядомы таксама як тэарэтык маст. слова, адзін з заснавальнікаў *рыторыкі* як навукі. Яго творы — узор класічнай польскай мовы. Яго гуманіст. ідэі паўплывалі на развіццё еўрап. грамадскай і паліт. думкі ў перыяд Адраджэння і ў эпоху Асветніцтва, у т.л. на светапогляд Ф.Скарыны, С.Буднага, А.Волана і інш. Сугучны ідэям Ц. і некаторыя ідэі Статутаў ВКЛ. На Беларусі творы Ц. сталі папулярнымі з 16 ст. Яны знаходзіліся ў б-ках ВКЛ на мове арыгінала і ў перакладзе на польскую мову, актыўна вывучаліся ў школах.

Тв.: Рус. пер. — Философские трактаты. М.,1985; О старости. О дружбе. Об обязанностях. 2 изд. М.,1993; Диалоги. 2 изд. М., 1994; Три трактата об ораторском искусстве. 2 изд. М., 1994.

Літ.: Утченко С.Л. Цицерон и его время. М., 1972; Грималь П. Цицерон: Пер. с фр. М., 1991. *Т.І.Адула.*

ЦЫЯЛКО́ЎСКІ Канстанцін Эдуардавіч (17.9.1857, с. Ижэўскае Разанскай вобл., Расія — 19.9.1935), расійскі вучоны і вынаходнік у галіне аэрадынамікі і ракетнай тэхнікі; заснавальнік *касманаўтыкі*. Адукацыю атрымаў самастойна. Экстэрнам здаў экзамены на званне настаўніка (1879) і ўсё жыццё выкладаў фізіку і матэматыку (з 1892 у г. Калуга). Працаваў над стварэннем тэорыі і канструкцыі суцэльнаметал. кіравальнага дырыжабля, потым самалёта-манаплана з метал. каркасам (1885—94). Пабудаваў першую ў Расіі аэрадынамічную трубу (1897) і даследаваў на ёй простыя мадэлі (1900). У 1883 выказаў думку пра магчымасць выкарыстання рэактыўнага руху пры стварэнні міжпланетных лятальных апаратаў. У «Даследаванні сусветных прастораў рэактыўнымі прыладамі» (1903) Ц. ўпершыню ў свеце тэарэтычна абгрунтаваў магчымасць міжпланетных зносін з дапамогай ракет, распрацаваў тэорыю палёту, вывеў законы руху ракеты як цела пераменнай масы. Даў інж. рашэнні канструкцыі ракет, асновы тэорыі вадкаснага ракетнага рухавіка і элементы яго канструкцыі, прапанаваў розныя віды паліва для ракетных рухавікоў. Упершыню абгрунтаваў неабходнасць выхаду чалавецтва ў космас для захавання і далейшага развіцця цывілізацыі; як першыя крокі ў гэтым кірунку яшчэ ў пач. 20 ст. прапанаваў стварэнне і выкарыстанне ШСЗ і арбітальных станцый. Ідэі Ц. выкарыстоўваюцца пры стварэнні сучасных ракетных рухавікоў, касм. ракет і апаратаў. АН СССР заснавала залаты медаль імя Ц. «За выдатныя заслугі ў галіне міжпланетных зносін» (1954). Імем Ц. названы кратэр на Месяцы.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—4. М., 1951—64; Путь к звездам. 2 изд. М., 1961; Промышленное освоение космоса. М., 1989.

Літ.: Космодемьянский А.А. К.Э.Циолковский. М., 1976; Арлазоров М.С. Циолковский. 3 изд. М., 1967; Впереди своего века. М., 1970. *У.С.Ларыёнаў.*

ЦЫЯ́Н, дыцыян, бясколерны газ, C_2N_2.

Мае рэзкі пах, мал. м. 52,035; $t_{пл}$ — 27,8 °С, $t_{кіп}$ — 21, 15 °С. Абмежавана растваральны ў вадзе, лепш — у этаноле, воцатнай к-це. У прысутнасці дамешкаў пры 300—500 °С ператвараецца ў аморфны палімер — парацыян $(CN)_n$ (n = 2000—3000), які пры 800 °С цалкам дэпалімерызуецца. Мае т.зв. псеўдагалагенныя ўласцівасці: напр., падобна хлору ўзаемадзейнічае з воднымі растворамі шчолачаў. Атрымліваюць каталітычным акісленнем сінільнай к-ты, узаемадзеяннем распаленага коксу з азотам і інш. Выкарыстоўваецца ў ар-

ган. сінтэзе, для газавай рэзкі і зваркі металаў. Гаручы; атрутны, аказвае раздражняльнае дзеянне.

ЦЫЯНАБАКТЭ́РЫІ (ад грэч. kyanos сіні + *бактэрыі*), група фотатрофных *пракарыётаў*, што наз. *сіне-зялёнымі водарасцямі*.

Уключаюць аднаклетачныя і шматклетачныя (ніткаватыя) формы. Да бактэрый сіне-зялёныя водарасці адносяць паводле будовы клетак (напр., не маюць абмежаванага мембранай ядра), наяўнасці агульных спецыфічных злучэнняў (напр., мурэіну ў клетачнай сценцы), блізкасці іх генет. уласцівасцей. Таксама Ц. ўключаюць у бат. класіфікацыю паводле іх здольнасці, як вышэйшых раслін і водарасцей, да фотасінтэзу з выдзяленнем малекул кісларoду. Многія фіксуюць малекулярны азот. Назва «Ц.» выкарыстоўваецца ў мікрабіял. літаратуры, у батанічнай часцей ужываецца назва «сіне-зялёныя водарасці».

ЦЫЯНАВА́ННЕ, 1) насычэнне паверхневых слаёў стальных вырабаў адначасова вугляродам і азотам пры награванні ў расплаве, які мае ў сабе *цыянід* (напр., NaCN); адзін са спосабаў *хімікa-тэрмічнай апрацоўкі* металаў. 2) Здабыванне серабра і золата з руд селектыўным вышчалочваннем растворамі цыянідаў, звычайна NaCN. 3) Увядзенне цыянагрупы CN у малекулу хім. злучэння; спосаб атрымання *нітрылаў*.

ЦЫЯНЕ́І (Cyanea), род медуз атр. дыскамедуз кл. сцыфоідных. Некалькі відаў. Пашыраны ў паўн. ч. Атлантычнага і Ціхага ак., у морах Паўн. Ледавітага акіяна.

Дыям. парасона ад некалькіх сантыметраў да 2 м. Афарбоўка цела звычайна яркая, парасон бураваты або малінавы. З ніжняга боку парасона звісаюць доўгія (да 40 м), сабраныя ў 8 пучкоў шчупальцы з *жыгучымі клеткамі* і тонкія махрыстыя ротавыя лопасці кармінавага або малінавага колеру. Ёсць паліплоіднае пакаленне. Гл. таксама *Медузы*. Іл. гл. да арт. *Сцыфоідныя*.

ЦЫЯНІ́ДЫ, цыяністыя солі, неарганічныя злучэнні, солі *сінільнай кіслаты*.

Ц. шчолачных і шчолачна-зямельных металаў — іонныя злучэнні, добра растваральныя ў вадзе. Пры павышанай т-ры Ц. шчолачных і шчолачна-зямельных металаў цалкам гідралізуюцца. Атрымліваюць Ц. шчолачных металаў узаемадзеяннем шчолачаў з HCN, шчолачна-зямельных — абменнымі рэакцыямі і інш. спосабамі. Ц. падгрупы цынку — дыямагнітныя рэчывы. Ц. цяжкіх металаў (акрамя ртуці) не растваральныя ў вадзе, іх атрымліваюць рэакцыяй хларыдаў, сульфатаў або нітратаў з NaCN або KCN. Утвараюць цыянаты (узаемадзеянне з O_2), галагенцыяніды (з Cl, Br, I), *нітрылы*. Выкарыстоўваюць у гальванатэхніцы для атрымання метал. пакрыццяў, як каталізатары шэрагу хім. працэсаў, у вытв-сці пігментаў, фарбаў і інш. Моцныя яды; удыханне прыводзіць да сардэчнай недастатковасці. ГДК 0,3 мг/м^3 у пераліку на HCN.

ЦЫЯНІСТАВАДАРО́ДНАЯ КІСЛАТА́, тое, што *сінільная кіслата*.

ЦЫЯ́НІСТЫ ВАДАРО́Д, тое, што *сінільная кіслата*.

ЦЫЯ́НІСТЫЯ СО́ЛІ, тое, што *цыяніды*.

ЦЫЯНКАБАЛАМІ́Н, вітамін B_{12}, кабаламін, адзін з вітамінаў групы В, $C_{63}H_{88}CoN_{14}O_{14}P$. Сінтэзуецца толькі мікраарганізмамі (бактэрыямі, актынаміцэтамі, сіне-зялёнымі водарасцямі). Чалавек атрымлівае Ц. з ежай (усмоктваецца ў комплексе з гастрамукапратэінам, утвораным слізістай абалонкай страўніка). Асн. крыніца Ц. — печань буйн. раг. жывёлы і марскіх рыб, ныркі, мяса, малако, яйкі. Мае ў саставе кобальт і амідны азот (адсюль назва «кабаламін»).

Крышт. рэчыва цёмна-чырв. колеру, без паху, мал. м. 1355,4, растваральна ў вадзе, у 95%-ным этаноле, не растваральна ў ацэтоне, эфіры. У крышт. стане атрыманы ў 1948. Неабходны для абмену *фолievай кіслаты*, сінтэзу *нуклеінавых кіслот*, удзельнічае ў біясінтэзе *метыяніну*, уплывае на вугляводны і тлушчавы абмен, удзельнічае ў кроваўтварэнні. Ад нястачы Ц. развіваецца малакроўе (злаякасная анемія Адысона—Бірмера), зніжэнне ў крыві колькасці лейкацытаў, трамбацытаў, пашкоджанне спіннога, галаўнога мозга і перыферычнай нерв. сістэмы. Сутачная патрэбнасць чалавека ў Ц. — 3 мкг. У прам-сці атрымліваюць мікрабіял. сінтэзам. Выкарыстоўваецца ў медыцыне. *І.М.Семяненя.*

ЦЫЯНО́З, тое, што *сінюха*.

ЦЬЕ́ПАЛА (Tiepolo) Джавані Батыста (5.3.1696, г. Венецыя, Італія — 27.3.1770), італьянскі мастак; адзін з буйнейшых прадстаўнікоў *венецыянскай школы жывапісу*. Вучыўся ў Венецыі ў Г.Ладзарыні, зазнаў уплыў П.*Веранезе* і Дж.Б.П'яцэты. Працаваў пераважна ў Венецыі (у 1756—58 прэзідэнт Венецыянскай АМ), а таксама ў Мілане, Вюрцбургу, Мадрыдзе. Раннім творам уласцівы неспакойныя формы і кантрастны святлацень (цыкл карцін для палаца Дальфіна ў Венецыі, пасля 1725). Пазней творы набылі свабоду і экспрэсіўнасць, больш светлы каларыт, тонкую нюансіроўку (плафоны цэрквяў Джэзуаці, 1737—39; Скальцы,1743—44) у Венецыі. Фрэскавыя цыклы сярэдзіны 18 ст. вылучаюцца святочнай пышнасцю, прасторавай дынамікай, дасканаласцю святлотаветраных эфектаў, нечаканасцю пунктаў гледжання і ракурсаў, вытанчаным каларытам, пабудаваным на спалучэнні пяшчотных серабрыстых, чырванаватых, залаціста-жоўтых, жамчужна-шэрых і сініх тонаў: размалёўкі палаца Лабія ў Венецыі (1747—50), епіскапскай рэзідэнцыі ў Вюрцбургу (1750—53), вілы Вальмарана каля Вічэнцы (1757), плафонаў Каралеўскага палаца ў Мадрыдзе (1762—66). Яркай эмацыянальнасцю вобразаў і віртуознасцю жывапіснай тэхнікі вызначаюцца станковыя карціны «Трыумф Амфітрыты» (каля 1740), «Пакланенне вешчуноў» (1753). Пісаў таксама партрэты («Сход у Арэне», 1748—50), рабіў малюнкі і афорты.

Літ.: Дж.Б.Тьеполо: [Альбом]. М.; Л., 1963. Виппер Б.Р. Проблема реализма в итальянской живописи XVII—XVIII вв. М., 1966.

Т.В.Пешына

Дж.Б.**Цьепала**. Размалёўка «Баляванне Антонія і Клеапатры» ў палацы Лабія ў Венецыі. Італія. 1747—50.

ЦЬЕР (Thiers) Адольф (14.4.1797, г. Марсель, Францыя — 3.9.1877), французскі дзярж. дзеяч, гісторык. Чл. Франц. акадэміі (з 1833). Па прафесіі адвакат. У час *Ліпеньскай манархіі* прэм'ер-міністр і міністр замежных спраў. Быў арганізатарам жорсткага задушэння рэсп. паўстанняў 1834 у Ліёне, Парыжы і інш. Напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі 1848 перайшоў у апазіцыю да ўрада Гізо, падтрымліваў кандыдатуру Л.Банапарта (гл. *Напалеон III*) у прэзідэнты. Пасля банапартысцкага пераварота 1851 адышоў ад паліт. дзейнасці, з 1863 у памяркоўна-ліберальнай апазіцыі. Пасля рэвалюцыі 1870 у Францыі ў 1871 узначаліў выканаўчую ўладу Франц. рэспублікі; заключыў зневажальны для Францыі мірны дагавор з Прусіяй. У час *Парыжскай камуны 1871* узначаліў версальцаў у барацьбе супраць камунараў. Са жн. 1871 прэзідэнт *Трэцяй рэспублікі*. З 1873 у адстаўцы. Ц. — адзін з заснавальнікаў новага кірунку ў гістарыяграфіі, які прызнаваў барацьбу класаў ключом да разумення ўсёй франц. гісторыі, але заканамерна лічыў толькі барацьбу паміж буржуазіяй і дваранствам. Аўтар «Гісторыі Французскай рэвалюцыі» (1823—27), «Гісторыі Консульства і Імперыі» (1845—69).

ЦЬЕРЫ́ (Thierry) Агюстэн (10.5.1795, Блуа, Францыя — 22.5.1856), французскі гісторык, адзін з заснавальнікаў раманц. кірунку ў франц. гістарыяграфіі. Чл. Акадэміі подпісаў (з 1830). Скончыў Вышэйшую нармальную школу (1813) У 1814—17 сакратар К.А.*Сен-Сімона*. Асн. творы: «Гісторыя заваявання Англіі нарманамі» (т. 1—3, 1825), «Лісты па гісторыі Францыі» (1827), «Гісторыя паходжання і поспехаў трэцяга саслоўя» (1853). У якасці асн. крыніц сваіх тво-

раў выкарыстоўваў хронікі і паданні. Гал. задачай гісторыкаў лічыў мастацкае аднаўленне мінулага з дапамогай інтуіцыі. Гал. суб'ектам гісторыі лічыў «народ», які супрацьстаяў дваранству. Гіст. працэс разглядаў як барацьбу паміж класамі: трэцім саслоўем (буржуазія і сялянства) і прывілеяванымі саслоўямі (дваранства і духавенства). Даказваў, што паходжанне класаў — вынік завалявання адных народаў другімі. Не ідэалізаваў сярэдневякоўе, наз. яго эпохай «ваеннага дэспатызму». Паўплываў на еўрап. гісторыкаў.

Тв.: Рус. пер. — Избр. соч. М., 1937.

ЦЬЕТЭ́, Тьетэ (Tietê), рака на ПдУ Бразіліі, левы прыток р. Парана. Даўж. 1130 км, пл. бас. 72 тыс. км^2. Вытокі ў гарах Сера-ду-Мар, каля ўзбярэжжа Атлантычнага ак.; цячэ па Бразільскім пласкагор'і, утварае парогі; перад вусцем — вадаспад Ітапура (выш. 22 м). Летнія паводкі. Сярэдні расход вады ў ніжнім цячэнні каля 620 м^3/с. У бас. Ц. вадасховішча, ГЭС. На Ц. г. Сан-Паўлу.

ЦЬМА, у лікавай сістэме Стараж. Русі — 10 тыс.; цьма цем — 100 тыс. У пераносным сэнсе Ц. — незлічонае мноства, безліч, цьма-цьмушчая; адсюль бел. — процьма.

ЦЬМЯ́НЕЦ (Chaerophyllum), род кветкавых раслін сям. парасонавых (сельдэрэевых). Каля 40 відаў. Пашыраны ва ўмераным поясе Еўразіі і Амерыкі. На Беларусі 6 відаў. Найб. вядомыя Ц.: дурманлівы (Ch. temulum); духмяны (Ch. aromaticum), нар. назва дзеньчаль, клубняносны (Ch. bulbosum). Трапляюцца ў шыракалістых лясах, хмызняках, ярах.

Цьмянец чырванаваты.

Двух- і шматгадовыя травяністыя расліны. Сцёблы прамастойныя. Лісце шматразова-перыстарассечанае. Кветкі дробныя, белыя, радзей ружовыя, пурпурныя ў складаных парасонападобных суквеццях. Плод — віслаплоднік. Як гароднінную культуру вырошчваюць Ц. клубняносны (клубнепадобныя карэнішчы спажываюць у ежу). Лек., харч., меданосныя расліны, некат. ядавітыя і пустазелле.

Дз.І.Траццякоў.

ЦЬЮ́РЫНГ (Turing) Алан Матысан (23.6.1912, Лондан — 7.6.1954), англійскі матэматык і інжынер; адзін са стваральнікаў інфарматыкі і тэорыі праграмавання. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1951). Скончыў Кембрыджскі ун-т (1935). З 1939 у аддз. камунікацый МЗС Вялікабрытаніі, з 1945 у Нац. фіз. лабараторыі, з 1948 у Манчэстэрскім ун-це. Навук. працы па матэм. логіцы і выліч. матэматыцы. Стварыў тэорыю універсальных аўтаматаў і першую ў Вялікабрытаніі выліч. машыну. Увёў матэм. паняцце абстрактнага эквівалента алгарытму, ці выліч. функцыі (1936—37), што ў далейшым атрымала назву «машына Ц.» (гл. *Алгарытмаў тэорыя*). Займаўся праблемамі дастасавання матэматыкі да біялогіі.

Тв.: Рус. пер. — Может ли машина мыслить? С прил. статьи Дж. фон Неймана «Общая и логическая теория автоматов». М., 1960.

Літ.: Машины Тьюринга и рекурсивные функции: Пер. с нем. М., 1972.

ЦЭАЛІ́ТЫ (ад грэч. zeō кіплю + lithos камень), група мінералаў з класа *сілікатаў*, водныя *алюмасілікаты* кальцыю і натрыю, радзей інш. шчолачных і шчолачназямельных металаў. Бываюць сінт. і прыродныя (анальцым, натраліт, гейландыт, ламантыт, шабазіт і інш.).

Белыя ці бясколерныя, жаўтаватыя, ружаватыя крышталі розных крышталеграфічных сінганій. Шчыльнасць 1900—2800 кг/м^3. Тэрма- і кіслотаўстойлівыя. Пры награвanні ўспучваюцца (адсюль назва), лёгка аддаюць і зноў паглынаюць нязвязаную ваду, не мяняючы сваёй структуры. Радовішчы прыродных Ц. пашыраны ў свеце, у т.л. на Беларусі. Сінт. атрымліваюць крышталізацыяй пры 80—100 °С сумесі сілікатаў і алюмінату натрыю. Выкарыстоўваюць пры высушванні, ачыстцы і раздзяленні рэчываў, у якасці іонаабменнікаў, каталізатараў ці іх носьбітаў.

ЦЭ́БАР, у беларусаў пасудзіна для кармлення жывёлы; бандарны выраб. Падобны да *ражкі*, але большых памераў (ёмістасць 25—30 л, дно крыху вузейшае; былі і прамыя Ц.). У іх замешвалі сечку, рабілі «паранку» (сечка, залітая кіпнем) карове, каню. Ц. меншых памераў выкарыстоўвалі для прыгатавання пойла цялятам, ягнятам. Пусты Ц. пераносіў за «вушкі» (процілеглыя клёпкі з адтулінай) адзін чалавек, а напоўнены неслі ўдваіх, узяўшыся за канцы прасунутай палкі. У наш час амаль выйшаў з ужытку.

ЦЭГА́К-ГАЛУБО́ВІЧ Гелена (1902, г. Івана-Франкоўск, Украіна — 1979), бел. і польскі археолаг. Дацэнт (1956), праф. (1968). Скончыла Львоўскі ун-т (1930). З 1931 супрацоўнік кафедры археалогіі Віленскага ун-та, з 1940 — Літоўскага музея мастацтва. У 1945 супрацоўнік Ін-та гісторыі АН БССР. З канца 1945 ад'юнкт кафедры археалогіі Тарунскага, у 1950—56 — Вроцлаўскага ун-таў. У 1930-я г. разам з мужам У.*Галубовічам* праводзіла археал. раскопкі на

Г.Цэгак-Галубовіч.

тэр. Глыбоцкага, Лідскага, Міёрскага, Навагрудскага, Пастаўскага і інш. раёнаў каля в. Вята, Наўры, Паддубнікі, Чарневічы, Чурылава і інш.

Тв.: Zabytki archeologiczne województwa Wileńskiego i Nowogródzkiego. Wilno, 1936; Słowiańskie groby kurhanowe koło Czerniewicz w pow. Dziśnieńskim // Wiadomości archeologiczne. Warszawa, 1939. T. 16; Славянские поселения правобережной Дисны в Вилейском округе БССР (разам з У.Галубовічам) // Краткие сообщения Ин-та истории материальной культуры АН СССР. М., 1945. Вып. 11.

Л.У.Дучыц.

Цэбар.

ЦЭ́ГЛА, штучны каменны матэрыял (выраб) правільнай формы, звычайна ў выглядзе прамавугольнага паралелепіпеда. Вырабляецца з мінер. сыравіны, пасля абпалу або апрацоўкі парай набывае каменепадобныя ўласцівасці (трываласць, вада- і марозаўстойлівасць).

Адрозніваюць Ц. будаўнічую (гліняную абпаленую і вапнава-пясчаную, або *сілікатную*

цэглу, атрыманую аўтаклаўнай апрацоўкай), вогнетрывалую (шамотную, магнезітавую, дынасавую і інш., якая ідзе на муроўку прамысл. печаў, комінаў) і тугаплаўкую (вогнетрываласць не менш за 1350 °С; выкарыстоўваецца для брукавання дарог, тратуараў, абліцоўкі гідратэхн. збудаванняў, муроўкі фундаментаў і інш.). Буд. Ц. бывае суцэльная і пустацелая, звычайная, абліцовачная, лёгкая і спец. прызначэння (кіслотаўстойлівая Ц., дарожны *клінкер* і інш.). Цагляны *друз* выкарыстоўваюць як запаўняльнік для бетонаў. Выкарыстанне абпаленай Ц. вядома з глыбокай старажытнасці (з 3—2-га тыс. да н.э.) у Стараж. Егіпце, Індыі, Месапатаміі, пазней — у Стараж. Рыме, з 17 ст. — ва «ўзорыстай» архітэктуры Расіі.

На Беларусі Ц. вырабляюць з даўніх часоў (з 12 ст. захавалася цагляная *Гродзенская Барысаглебская царква*). У 1973 у Мінскім НДІ буд. матэрыялаў распрацавана тэхналогія вырабу сілікатнай лёгкай цэглы. Цагельныя з-ды Беларусі вырабляюць пераважна гліняную і сілікатную Ц. *Я.М.Кавалёў.*

ЦЭ́ДРА (ад італьян. cedro цытрон), вонкавы афарбаваны слой каляплоднікa раслін сям. рутавых (апельсіна, лімона, грэйпфрута). У Ц. размешчаны залозістыя ўмяшчальнікі з эфірнымі масламі, якія надаюць пладам водар. Выкарыстоўваюць у парфумернай, кандытарскай, лікёра-гарэлачнай вытв-сцях.

ЦЭ́ДРЫК Міхаіл Сямёнавіч (9.5.1930, в. Доўгі Лог Бярэзінскага р-на Мінскай вобл. — 29.11.1994), бел. фізік і педагог. Д-р фізіка-матэм. н. (1984), праф. (1985). Засл. работнік вышэйшай школы Беларусі (1980). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1954), дзе і працаваў (з 1961 і з 1993 заг. кафедры, з 1971 прарэктар). Навук. працы па фізіцы сегнетаэлектрыкаў, даследаванні працэсаў крышталізацыі і ўплыву знешніх фактараў пры вырошчванні сегнетаэл. крышталёў на іх структуру і фіз. ўласцівасці. Аўтар першага на бел. мове «Курса агульнай фізікі: Цеплыня і малекулярная фізіка» (1994) і інш.

Тв.: Физические свойства кристаллов семейства триглицинсульфата. Мн.,1986; Сборник задач по курсу общей физики. М., 1989 (у сааўт.); Кіраўніцтва да рашэння задач па агульнай фізіцы. Мн., 1995 (разам з В.М.Варыкашам). *А.І.Болсун.*

ЦЭДЭНБА́Л Юмжагійн (17.9.1916, Убсунурскі аймак, Манголія — 20.4.1991), палітычны і дзярж. дзеяч Манголіі. Скончыў Фін.-эканам. ін-т у г. Іркуцк (Расія, 1938). З 1939 нам. міністра, міністр фінансаў Мангольскай Нар. Рэспублікі (МНР). У 1940—54 і 1981—84 генеральны, у 1958—81 1-ы сакратар ЦК Манг. нар.-рэв. партыі (МНРП). У 1952—74 старшыня СМ, у 1974—84 старшыня Прэзідыума Вял. нар. хурала МНР. Праводзіў курс на пабудову ў МНР сацыялізму на сав. ўзор, у знешняй палітыцы арыентаваўся на СССР. У 1990 выключаны з МНРП.

ЦЭЗАЛЬПІ́НІЯ (Caesalpinia), род кветкавых раслін сям. бабовых. Каля 100 відаў. Пашыраны ў тропіках і субтропіках. Як дэкар. расліны культывуюць Ц.Джыліса (C. gilliesii) і японскую (C. japonica).

Вечназялёныя або лістападныя дрэвы і кусты (часам ліяны). Лісце двойчы парнаперыстае з прылісткамі. Кветкі ў гронках. Плод — струк. Драўніна шчыльная, чырв. або чорная, выкарыстоўваецца ў прам-сці. З некаторых відаў атрымліваюць дубільныя і фарбавальныя рэчывы. Тэхн., дэкар. расліны.

ЦЭ́ЗАР, к е с а р (лац. Caesar), у Старажытным Рыме першапачаткова імя адной з галін патрыцыянскага роду Юліяў, да якой належаў Гай Юлій *Цэзар*; у час імперыі тытул самога імператара і яго нашчадкаў.

ЦЭ́ЗАР Гай Юлій (Gaius Julius Caesar; 13.7.100—15.3.44 да н.э.), старажытнарымскі дзярж. і паліт. дзеяч, палкаводзец, пісьменнік. З патрыцыянскага роду Юліяў. У пач. паліт. дзейнасці выступаў на баку *папулярыяў* супраць Л.К.*Сулы* і яго прыхільнікаў. Займаў шэраг дзярж. пасад: ваенны трыбун, квестар, эдыл, прэтар. Змагаўся за аднаўленне правоў нар. трыбунаў, за рэабілітацыю марыянцаў. Імкнучыся да папулярнасці ў шыр. колах грамадства, наладжваў шыкоўныя відовішчы, грамадскія абеды. На пасадзе намесніка рым. правінцыі Далёкая Іспанія (у 60 да н.э.) выявіў адм. і ваен. здольнасці, разам з Г.*Пампеем* і М.*Ліцыніем Красам* увайшоў у т.зв. 1-ы *трыумвірат*. У 59 да н.э. абраны консулам, правёў шэраг законаў з мэтай умацавання дзярж. ладу і вырашэння сац. праблем. У 58 да н.э. атрымаў у кіраванне Галію, да 51 да н.э. заваяваў яе цалкам. У 55—53 да н.э. правёў паспяховыя паходы ў Брытанію і Германію. У выніку гібелі Краса (53 да н.э.) трыумвірат распаўся, суперніцтва паміж Ц. і Пампеем перарасло ў грамадз. вайну 49—45 да н.э. Пасля разгрому войск Пампея і яго саюзнікаў пад Ілердай, Фарсалам, Тапсам і Мундай Ц. узначаліў рым. дзяржаву. Сканцэнтраваў у сваіх руках паўнамоцтвы дыктатара (з 44 да н.э. пажыццёва), консула (з 47 да н.э. на 5, з 44 да н.э. на 10 гадоў), трыбуна, цэнзара (пажыццёва з 44 да н.э.), усталяваў асабістую ўладу, захаваўшы рэсп. формы кіравання. Правёў

Г.Ю.Цэзар.

дзярж., адм., суд., грашовую і каляндарную (у 46 да н.э. т.зв. юліянскі каляндар) рэформы, перапіс насельніцтва Італіі. Узмацненне ўлады Ц. выклікала моцнае супраціўленне сенацкай апазіцыі і прарэсп. знаці. У выніку змовы (больш за 80 чал.) на чале з Л.Г.*Касіем* і М.Ю.*Брутам* Ц. забіты на пасяджэнні сената. Аўтар «Запісак пра Гальскую вайну», «Запісак пра грамадзянскую вайну». Вядомы зборнікі яго прамоў і пісьмаў, 2 памфлеты, шэраг паэт. твораў, трактат па граматыцы (не захаваліся).

Тв.: Рус. пер. — Записки Юлия Цезаря и его продолжателей о Галльской войне, о Гражданской войне, об Александрийской войне, об Африканской войне. М., 2002.

Літ.: У т ч е н к о С.Л. Юлий Цезарь. 2 изд. М., 1984; Д у р о в В.С. Юлий Цезарь: Человек и писатель. Л., 1991; Ф е д о р о в а Е.В. Императорский Рим в лицах. 2 изд. Смоленск, 1995; Ф е р р е р о Г. Юлий Цезарь. Ростов н/Д, 1997. *А.Г.Зельскі.*

Цэзальпінія японская.

ЦЭ́ЗІЙ (лац. Caesium), Cs, хімічны элемент I групы перыяд. сістэмы, ат. н. 55, ат. м. 132,905; адносіцца да *шчолачных металаў*. Прыродны Ц. — стабільны нуклід ^{133}Cs. У зямной кары 3,7 · 10^{-4}% па масе, асн. мінерал — палуцыт. Адкрыты ў 1860 Р.В.*Бунзенам* і Г.Р.*Кірхгофам*, назва ад лац. caesium — блакітны (па ярка-сініх лініях у спектры).

Вельмі мяккі, легкаплаўкі ($t_{пл}$ 28,44 °С) серабрыста-белы метал, шчыльн. 1904 кг/м^3 (20 °С). Хімічна найб. актыўны шчолачны метал. На паветры імгненна акісляецца з узгараннем (утвараецца надпераксід CsO_2 з прымессю пераксіду Cs_2O_3). З вадой, галагенамі і разбаўленымі к-тамі ўзаемадзейнічае з выбухам. Захоўваюць у ампулах са шкла пірэкс у атмасферы аргону або ў стальных герметычных пасудзінах пад слоем абязводжанага вазелінавага масла. Выкарыстоўваюць метал. Ц. як кампанент матэрыялаў катодаў для фотаэлементаў і фотаэлектронных памнажальнікаў, змазачных матэрыялаў для касм. тэхнікі, у вакуумных электронных прыборах; па́ру —

як рабочае цела ў магнітагідрадынамічных генератарах, газавых лазерах, іонных ракетных рухавіках. Прадукты ядз. рэакцыі дзялення маюць значную колькасць розных радыенуклідаў Ц., найб. небяспечны з іх ^{137}Cs (перыяд паўраспаду 30 гадоў). *А.П.Чарнякова.*

ЦЭЗУ́РА (лат. caesura рассячэнне), пастаянная ўнутрырадковая паўза, якая дзеліць на інтанацыйна-рытмічныя часткі вершаваны радок твора, напісанага ант., сілабічным ці сілаба-танічным вершам. У ант. паэзіі прыпадала на сярэдзіну стапы. Такое размяшчэнне Ц. сустракаецца і ў сілаба-танічных вершах, аднак найчасцей яна супадае з заканчэннем стапы і слова і знаходзіцца пасля 2-й стапы ў 4- і 5-стопных вершах, пасля 3-й у 6-стопных, пасля 4-й у 7- і 8-стопных. Ц., як і *клаўзула*, бывае з нарашчэннем або ўсячэннем стапы. Нярэдка апошнія словы паўрадкоўяў, раздзеленых Ц., рыфмуюцца:

З шумам бо**раў**, / ясако**раў**,
Ой, гаю, ой, гаю,
На жале**йцы**- / дабрадзе**йцы**
Думку дум зайграю.
(Я.Купала. «На жалейцы»)

Часам Ц. наз. любы словападзел у радку. *А.А.Майсейчык.*

ЦЭЙЛО́Н (Ceylon), назва востраў і дзяржавы *Шры-Ланка* да 1972.

ЦЭЙС (Zeiss) Карл Фрыдрых (11.9.1816, г. Веймар, Германія — 3.12.1888), нямецкі оптык-механік, адзін з пачынальнікаў аптычнага прыладабудавання. У 1846 у г. Іена арганізаваў оптыка-мех. майстэрню (цяпер фірма «Карл Цэйс Іена») па вытворчасці аптычных прылад і аптычнага шкла.

ЦЭЙХГА́ЎЗ (ням. Zeughaus ад Zeug зброя + Haus дом), у арміях шэрагу краін, у т.л. ВКЛ, назва складскога памяшкання для захавання ўзбраення, рыштунку, абмундзіравання, харчавання і інш. Ва Узбр. Сілах Рэспублікі Беларусь аналагічнае паводле прызначэння памяшканне наз. склад.

ЦЭЛАБІЁЗА, узноўлены *дыцукрыд*, структурны фрагмент *цэлюлозы*. Атрымліваюць ацэтолізам цэлюлозы.

ЦЭ́ЛАЕ, гл. ў арт. *Частка і цэлае.*

ЦЭЛАЗО́ЛЬВЫ, тэхнічная назва простых монаэфіраў *этыленгліколю* і іх кампанентаў.

Гаручыя бясколерныя вадкасці са слабым спіртавым ці гліколевым пахам. Большасць растваряецца ў вадзе, спіртах, гліколях і інш. арган. растваральніках. Маюць хім. ўласцівасці, характэрныя для спіртоў і простых эфіраў. Атрымліваюць узаемадзеяннем этыленаксіду са спіртамі. Выкарыстоўваюць як растваральнік нітратаў і ацэтатаў цэлюлозы, прыродных і сінт. смол, полівінілацэтату; кампаненты саставаў для апрацоўкі скур, тканін і інш.

ЦЭЛАКА́НТ, рыба надатр. кісцяпёрых; гл. *Латымерыя.*

ЦЭ́ЛАСНАСЦЬ, абагульненая ўласцівасць аб'ектаў, што маюць складаную ўнутр. будову, якая характарызуецца адзінствам і ўзаемаабумоўленасцю іх частак. У залежнасці ад характару ўзаемасувязі частак вылучаюць структурны, функцыян., генет. тыпы Ц. У адрозненне ад *адытыўнасці* інтэгратыўныя якасці, што складаюць спецыфіку Ц., прынцыпова новыя ў параўнанні з уласцівасцямі ч. аб'екта і не зводзяцца да апошніх. Паняцце «Ц.» адлюстроўвае ўнутр. інтэграванасць і самадастатковасць *сістэмы*, паказвае недастатковасць тлумачэння яе функцыянавання і развіцця на падставе толькі вонкавых пабуджальных прычын. Спасціжэнне Ц. аб'екта дазваляе выявіць унутр. заканамернасці, якія абумоўліваюць яго якасную своеасаблівасць. Характэрная асаблівасць вышэйшых форм Ц. (біял., сац.) — самаразвіццё і самаўзнаўленне частак. На станаўленне ўяўленняў аб Ц. паўплывалі гештальтпсіхалогія, культ антрапалогія, сінт. тэорыя эвалюцыі. Паняцце «Ц.» выступае зыходным пунктам *сістэмнага падыходу*. Гл. таксама *Частка і цэлае.* *С.А.Яцкевіч.*

ЦЭЛАФА́Н (ад *цэлюлоза* + грэч. phanos светлы), празрыстая плёнка са шчолачных растворaў ксантагенату цэлюлозы (віскозы). Мае ў сабе 12% вады і каля 11% гліцэрыны. Таўшчыня 20—50 мкм, маса 1 м^2 30—100 г. Вызначаецца высокай пара- і вільгацепранікальнасцю, устойлівасцю да дзеяння тлушчаў. Псуецца ад вады, таму пакрываюць (лакіруюць) ахоўнай плёнкай (напр., з ацэтылцэлюлозы, поліэтылену і інш.). Выкарыстоўваецца як упаковачны матэрыял.

ЦЭ́ЛАЯ РАЦЫЯНА́ЛЬНАЯ ФУ́НКЦЫЯ, тое, што *мнагасклад.*

ЦЭ́ЛАЯ ФУ́НКЦЫЯ, функцыя, аналітычная на ўсёй плоскасці камплекснай пераменнай. Раскладаецца ў *ступенны шэраг*, збежны на ўсёй плоскасці. Адзіную ізаляваную асаблівасць мае толькі ў бясконца аддаленым пункце. Напр., калі гэты пункт з'яўляецца полюсам парадку *n*, то Ц.ф. — *мнагасклад* ступені *n*, а калі гэта істотна асаблівы пункт, то Ц.ф. — цэлая *трансцэндэнтная функцыя*. Вывучаюцца таксама Ц.ф. многіх камплексных пераменных, якія раскладаюцца ва ўсюды збежныя кратныя ступеневыя шэрагі.

ЦЭ́ЛАЯ ЧА́СТКА ЛІ́КУ, гл. ў арт. *Дробавая і цэлая часткі ліку.*

ЦЭ́ЛЕ (Celje), горад у Славеніі. Каля 40 тыс. ж. Прам-сць: цынкаплавільны з-д, металаапр., хім., дрэваапр., тэкст., гарбарна-абутковая. Руіны стараж.-рым. пабудоў (у т.л. храм Геркулеса, базілікі 4 ст.), гар. умацаванняў (15—18 ст.). Гатычная царква св. Данілы (14—15 ст.), рэнесансаваны палац (16 ст.), барочны манастыр капуцынаў (пач. 17 ст.), жылыя дамы (17—19 ст.).

ЦЭ́ЛЕБЕС (Celebes), востраў у Малайскім архіпелагу, другая назва в-ва *Сулавесі.*

ЦЭЛЕСЦІ́Н (ад лац. caelestis нябесны), мінерал класа сульфатаў, сульфат стронцыю, $Sr[SO_4]$. Мае SrO да 56,4%, часта прымесі CaO у суадносінах да SrO 1:1, BaO да 20—26% (у барытацэлесціне).

Цэлесцін.

Крышталізуецца ў рамбічнай сінганіі. Утварае таблітчастыя і прызматычныя крышталі, зярністыя, шасцаватыя і шкарлупістыя агрэгаты. Колер блакітны, белы, шэры, зрэдку бясколерны. Цв. 3—3,5. Шчыльн. 4 г/см^3. Крохкі. Паходжанне метасаматычнае, вулканагенна-асадкавае, жыльнае эпігенетычнае, асадкавае і інш. Трапляецца ў выглядзе ўкрапанікаў, жэод, гнёздаў, канкрэцый, буйных монамінеральных лінза- і жылападобных цел. Выкарыстоўваецца ў чорнай металургіі пры вырабе марозаўстойлівай сталі, у вытв-сці феерверкаў, трасіруючых куль, пры рафінаванні бураковага цукру.

ЦЭЛЕСЦІ́НЦЫ, члены манаскага ордэна, які з'яўляўся адгалінаваннем ордэна *бенедыкцінцаў*. Засн. ў Паўд. Італіі каля 1250 (зацверджаны ў 1264) будучым папам Цэлесцінам V (адсюль назва). З прычыны строгага статута ордэн не атрымаў пашырэння (колькасць манастыроў у Італіі і Францыі не перавышала 150). Ордэн перастаў існаваць у 1785. У 1294—1302 існавала іх асобная галіна «Бедныя пустэльнікі Цэлесціна», якая складалася з паслядоўнікаў спірытуалаў і прытрымлівалася крайняга аскетызму.

ЦЭЛІБА́Т (ад лац. caelebs нежанаты), абавязковая бясшлюбнасць каталіцкага духавенства. Прапанавана папам Грыгорыем VII у 1075; усталявалася з сярэдзіны 13 ст. Энцыклікай «Аб цэлібаце святароў» (1967) папа Павел VI пацвердзіў непахіснасць Ц.

ЦЭ́ЛІКАЎ Аляксандр Іванавіч (20.4.1904, Масква — 28.10.1984), савецкі вучоны ў

галіне металургіі. Акад. АН СССР (1964, чл.-кар. 1953). Герой Сац. Працы (1964). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча (1928). З 1935 на выкладчыцкай рабоце. З 1945 нач. канструктарскага бюро, з 1959 дырэктар Усесаюзнага н.-д. і праектна-канструктарскага ін-та металургічнага машынабудавання. Навук. працы па тэорыі пра-

А.І.Цэлікаў.

каткі і разліку пракатных станаў. Пад яго кіраўніцтвам створаны унікальныя пракатныя станы і агрэгаты; тэхналогія і агрэгаты сумяшчэння неперарыўнага ліцця металаў з пракаткай і інш. Ленінская прэмія 1964. Дзярж. прэміі СССР 1947, 1948, 1951. Залаты медаль імя М.В.Ламаносава АН СССР (1975).

Тв.: Теория расчета усилий в прокатных станах. М., 1962; Специальные прокатные станы. М., 1971 (у сааўт.).

ЦЭЛО́ЗІЯ (Celosia), род кветкавых раслін сям. амарантавых. Каля 60 відаў. Пашыраны ў тропіках і субтропіках Афрыкі, Амерыкі, часткова Азіі. На Беларусі культывуецца Ц. серабрыстая (C. argentea) і яе формы: Ц. серабрыстая грабеньчатая, або пеўнікавы грабеньчык, і серабрыстая перыстая.

Адна- і шматгадовыя травяністыя расліны выш. да 60 см. Сцёблы прамастойныя, галінастыя. Лісце чаргаванае, ад лінейнага да яйцападобнага. Шматлікія кветкі дробныя, бліскучыя, белыя, жоўтыя, ружовыя або чырв. ў коласападобных ці мяцёлчатых суквецціях, якія часта зрастаюцца разам і ўтвараюць «пеўнікавы грабеньчык». Плод — каробачка. Выкарыстоўваюць для зімовых букетаў, некат. віды спажываюць у ежу. Дэкар. расліны.

Цэлозія серабрыстая грабеньчатая.

ЦЭЛО́М (ад грэч. koilōma поласць, упадзіна), другасная поласць цела, прастора паміж сценкай цела і ўнутранымі органамі ў шматклетачных жывёл. Мае ўласныя эпітэліяльныя сценкі мезадэрмальнага паходжання, утрымлівае цэламічную вадкасць і звычайна адкрываецца вонкі спец. пратокамі — цэламадуктамі. Гал. і першасная функцыя Ц. — апорная, таксама падтрымлівае біяхім. пастаянства ўнутр. асяроддзя арганізма (водны, газавы, іонны, салявы, тэмпературны рэжымы), выконвае розныя другасныя функцыі: выдзяляльную, дыхальную, палавую, трафічную і інш. Жывёл, якія маюць Ц., наз. цэламічнымі (другаснаполасцевымі). Да іх адносяць вышэйшых першаснаротых (кольчатыя чэрві, малюскі, сіпункуліды, эхіурыды), другаснаротых (ігласкурыя, паўхордавыя, хордавыя, у т.л. пазваночныя), паганафор, шчацінкасківічных, шчупальцавых.

ЦЭЛУЛО́ІД (ад *цэлюлоза* + грэч. eidos выгляд), пластмаса на аснове нітрату цэлюлозы і пластыфікатару (камфары ці рыцыны). Шчыльнасць 1300—1350 кг/м^3. Гаручы, празрысты, водаўстойлівы, трывалы матэрыял. Выкарыстоўваецца для вырабу цацак, мячоў для настольнага тэніса, галантарэйных і канцылярскіх тавараў і інш.

ЦЭ́ЛЫ ЛІК, лік, які можна прадставіць як рознасць *натуральных лікаў*. Гл. *Лік*.

ЦЭЛЬНАГАЛО́ВЫЯ, злітнацарпныя (Holocephali), падклас храстковых рыб. 1 сучасны атр. *хімеры* і 2 выкапнёвыя — марскія рыбы каменнавугальнага перыяду.

ЦЭ́ЛЬСІЯ ШКАЛА́, адна з найб. пашыраных *тэмпературных шкал*. Апорныя тэмпературныя (рэперныя) пункты па *Міжнароднай практычнай тэмпературнай шкале*: т-ра *трайнога пункта* вады (0,01 °С; першасна — т-ра плаўлення лёду — 0 °С) і т-ра кіпення вады пры нармальным атм. ціску (100 °С; гл. *Градус Цэльсія*). Прапанавана швед. вучоным А.Цэльсіем (1742). Гл. таксама *Тэрмадынамічная тэмпературная шкала*.

ЦЭ́ЛЬСКАЯ ЛЯСНА́Я ДА́ЧА, балота ў Асіповіцкім р-не Магілёўскай вобл. і Пухавіцкім р-не Мінскай вобл., у вадазборы р. Сіняя (прыток р. Свіслач). Нізіннага (86%) і вярховага (14%) тыпаў. Уключае масівы Шаманшчына, Загуменне, Вял. Луг і інш. Пл. 7,2 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 3,8 тыс. га. Глыб. торфу да 1,7 м, сярэдняя 1,6 м. Большая ч. балота асушана, выкарыстоўваецца пад пасевы збожжавых і траў, часткова як натуральная сенажаць. Каля 2,9 тыс. га неасушана, пад лесам з хвоі і бярозы.

ЦЭ́ЛЬТЭР (Zelter) Карл Фрыдрых (11.12.1758, Берлін — 15.5.1832), нямецкі кампазітар, хармайстар, педагог, дырыжор. Ганаровы чл. Каралеўскай акадэміі прыгожых мастацтваў у Берліне (1806, з 1809 праф.). З 1800 кіраўнік Пеўчай акадэміі ў Берліне. Заснаваў першае ў Германіі аматарскае мужчынскае хар. т-ва (т.зв. лідэртафель, 1809), ін-ты царк. і школьнай музыкі ў Кёнігсбергу (1814), Брэславе (1815), кіраўнік Каралеўскага ін-та царк. музыкі (з 1822), заг. муз. аддзела Берлінскай каралеўскай б-кі. Аўтар больш як 200 песень, у т.л. 75 на тэксты І.В.Гётэ, хароў, кантат, тэатр. музыкі і інш. Сярод вучняў Я.Л.Ф.*Мендэльсон*, Дж.*Меербер*, К.О.Э.*Нікалаі*.

ЦЭЛЮЛА́ЗА, фермент класа гідралаз, які расшчапляе *цэлюлозу*. Ёсць у клетках мікраарганізмаў, у кішэчніку некаторых беспазваночных жывёл (напр., малюскаў), у праслым зерні. Найб. эфектыўныя прадуцэнты Ц.— грыбы. Ц. мікраарганізмаў, якія жывуць у стрававальным тракце траваедных жывёл, паскарае ператраўленне вугляводаў.

Існуюць 2 асн. тыпы Ц.: эндаглюканазы і цэлабіягідралазы. Характэрная іх уласцівасць — сумеснае дзеянне (*сінергізм*) на высокаўпарадкаваныя формы цэлюлозы (бавоўнянае валакно, мікракрышт. цэлюлоза). Выкарыстоўваецца ў вытв-сці сокаў і він (для іх асвятлення), камбікармоў (для іх лепшага засваення), для атрымання высакаякаснай паперы.

ЦЭЛЮЛІ́Т, запаленне падскурнай тлушчавай клятчаткі; тое, што *панікуліт*.

ЦЭЛЮЛО́ЗА, клятчатка, асноўны апорны *поліцукрыд* клетачных сценак раслін і некаторых беспазваночных (напр., асцыдый); найб. пашыраны *біяпалімер*. Вышэйшыя расліны штогод ператвараюць у арган. злучэнні 30 млрд. т вугляроду, на Ц. прыпадае каля 1/3.

Аморфна-крышт. рэчыва, шчыльнасць 1520—1540 кг/м^3. Лінейныя малекулы Ц. пабудаваны з 1,4-звязаных астаткаў β-D-глюкозы. Не растваральніках. У драўніне 50% Ц., у валасках насення бавоўны — 98%. Каб расшчапіць Ц. да глюкозы, ужываюць ферменты *цэлюлазы* і *цэлабіязы*. Вытворныя Ц. — *ацэтаты цэлюлозы*, складаныя эфіры — *нітраты цэлюлозы*. Існуе таксама структурная мадыфікацыя Ц. — *гідратцэлюлоза*. Выдаленне тэхн. Ц. з расл. сыравіны (драўніны) ажыццяўляюць яе варкай з рознымі хім. агентамі. Далей з Ц. выдаляюць мех. дамешкі, адбельваюць, надаюць высакароднасць. *Валокны прыродныя* і мадыфікаваныя з Ц. выкарыстоўваюцца ў тэкст. прам-сці, у вытв-сці паперы, кардону, пластмас, лакаў і інш.

ЦЭЛЮЛО́ЗНА-ПАПЯРО́ВАЯ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, галіна прамысловасці па вырабе *цэлюлозы, паперы* (пісчай, газетнай, чарцёжнай, святлоадчувальнай, туалетнай, папяроснай, упаковачнай і інш.), *кардону* і прадукцыі з іх (тары, блакнотаў, сшыткаў, сурвэтак і інш.). Сыравіна — драўніна, салома, трыснёг і інш. Прадукцыя Ц.-п.п. выкарыстоўваецца амаль ва ўсіх галінах нар. гаспадаркі. Найб. развіта ў ЗША, Фінляндыі, Швецыі, Германіі, Вялікабрытаніі, Японіі, Францыі, Расіі і інш.

На Беларусі першыя папяровыя прадпрыемствы з'явіліся ў 18 ст. У 1850 было 10 мануфактур (600 рабочых). З сярэдзіны 19 ст. на выраб паперы выкарыстоўвалася драўніна. З 1872 дзейнічаюць *Добрушская папяровая фабрыка*, у 1881 — *Мінская шпалерная фабрыка*. У 1900 дзейнічала 75 папярова-друкарскіх мануфактур і 25 ф-к. У 1913 выпушчана 21,3 тыс. т паперы і 5,3 тыс. т кардону. Пасля Вял. Айч. вайны разбураныя прадпрыемствы Ц.-п.п. адноўлены. У

Да арт. **Цэлюлозна-папяровая прамысловасць**. Добрушская папяровая фабрыка «Герой працы».

2002 Ц.-п.п. уключала больш за 20 прадпрыемстваў, найб. буйныя — Добрушская папяровая ф-ка «Герой працы», *Светлагорскі цэлюлозна-кардонны камбінат*, *Слонімскі кардонна-папяровы завод*, *Шклоўская папяровая фабрыка*, Барысаўская папяровая ф-ка «Дзяржзнак», Маладзечанская кардонная ф-ка «Раёўка». Выкарыстоўваецца мясц. і прывазная (з Расіі, ЗША і інш.) сыравіна, пераважна цэлюлоза. Выраб цэлюлозы (2001) склаў 51 тыс. т, паперы — 51,5 тыс. т, кардону — 165 тыс. т. Асн. ч. прадукцыі спажываецца ў рэспубліцы. Экспарт паперы для шпалер (2000) склаў 28,4 тыс. т (у Расію, Латвію, Літву). Імпарт немелаванай паперы і кардону (2000) у Беларусь — 65 тыс. т (з Расіі, Вялікабрытаніі, Літвы, Фінляндыі, Германіі). *П.І.Рогач.*

ЦЭМЕ́НТ (ням. Zement ад лац. caementum друз), парашкападобнае *вяжучае рэчыва* (пераважна гідраўл.), здольнае ўтвараць з вадой (воднымі растворамі солей або інш. вадкасцямі) пластычную масу, што з часам загусае і пераходзіць у каменепадобны стан.

У залежнасці ад сыравіны і спосабу атрымання адрозніваюць віды Ц.: портландцэмент і яго разнавіднасці (шлакавы і пуцаланавы; гл. *Пуцаланы*), гліназёмісты, расшыральны і шэраг спец. марак (напр., кіслотатрывалы). Прамысл. вытв-сць з 19 ст. Найб. пашыраны портландцэмент — прадукт тонкага памолу, атрыманы абпальваннем да спякання (т-ра каля 1450 °С) вапняку і гліны (суадносіны 3:1). Каб палепшыць тэхн. ўласцівасці, пры памоле да *клінкеру* дадаюць каля 3% двухводнага гіпсу і каля 15% актыўных мінер. дабавак (*дыятаміту*, трэпелу, доменнага гранулянага шлаку і інш.). Якасць Ц. вызначаецца тонкасцю памолу, тэрмінам ахоўвання і маркай (характарыстыкай трываласці пры сціскванні стандартных узораў) — абазначаецца лічбамі 200, 300, 400, 500, 600 і 700. Чым вышэй марка, тым больш трывалы выраб на яго аснове. Асн. галіны выкарыстання Ц. — атрыманне маналітнага і зборнага *бетону* і *жалезабетону*, прыгатаванне буд. растворaў.

На Беларусі Ц. выпускае прадпрыемства *«Ваўкавыскцэментнашыфер»*, ВА *«Крычаўцэментнашыфер»*. *Я.М.Кавалёў.*

ЦЭМЕНТАВА́ННЕ, працэс пакрыцця (змацавання) *цэментам* чаго-н. Гл. таксама *Цэментацыя*.

ЦЭМЕ́НТАВАЯ СЫРАВІ́НА, горныя пароды і мінералы, якія выкарыстоўваюцца ў вытворчасці цэменту. Для выпрабу 1 т цэментавага клінкеру (паўпрадукту) выдаткоўваецца 1,7—2 т асн. Ц.с. (каля 80% карбанатнай і 20% гліністай). Для партландцэментаў гал. відамі сыравіны з'яўляюцца вапняк, мел, вапнавы туф, мергель, гліна. Асн. дабаўкі — гіпс і ангідрыт; карэкціруючыя — трэпел, апока, баксіт, кварцавы пясок; актыўныя мінер. дабаўкі — попел, дыятаміт, пемза, туф. Для гліназёмістых цэментаў гал. відамі сыравіны з'яўляюцца баксіты, вапнякі з ангідрытамі і гіпсамі. Радовішчы Ц.с. шырока распаўсюджаны. На Беларусі ў якасці Ц.с. разведана радовішчаў: 7 мергельна-мелавых пародаў, 33 мелу, 227 глін. *У.Я.Бардон.*

ЦЭМЕНТА́ЦЫЯ, 1) у металаапрацоўцы — дыфузійнае насычэнне паверхневага слоя метал. (пераважна стальных) вырабаў вугляродам пры т-ры 900—950 °С; адзін з відаў *хіміка-тэрмічнай апрацоўкі*.

Павышае цвёрдасць, зносаўстойлівасць і стомленасную трываласць. Робіцца ў сумесях газаў (газавая Ц.), у ваннах з расплаўленых солей (вадкая Ц.). Глыбіня навугляроджанага пры Ц. слоя 0,5—3 мм, часам да 20 мм. Ц. выкарыстоўваюць у вытв-сці шасцерняў, восей, валоў і інш.

2) У каляровай металургіі — гідраметалургічны працэс, заснаваны на выцясненні (*асаджэнні*) больш электрададатных металаў з растворaў іх злучэнняў менш электрададатнымі, што знаходзяцца ў цвёрдым стане. Такім спосабам ачышчаюць растворы ад дамешкаў (напр., электраліты пры вытв-сці нікелю), здабываюць металы іх асаджэннем (напр., золата з яго цыяністых растворaў) і інш. Гл. таксама *Гідраметалургія*. 3) У будаўніцтве — спосаб *замацавання грунтоў*, каменных і бетонных муровак вадкім цэментным растворам або цэментнай суспензіяй, якія нагнятаюцца ў пустоты, шчыліны, поры, свідравіны і інш. 4) У горнай справе — замацаванне сыпкіх адкладаў і ператварэнне іх у цвёрдыя горныя пароды карбанатамі, вокісламі крэмнію і інш.

ЦЭМЕ́НТНАЯ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, галіна *будаўнічых матэрыялаў прамысловасці* па вырабе розных відаў *цэменту*, таксама азбестцэментных лістоў (шыферу) і труб, вапны для буд-ва, гранулянага мелу і інш. Найб. развіта ў ЗША, Грэцыі, Іспаніі, Германіі, Францыі, Японіі, Расіі, Польшчы, Вялікабрытаніі і інш.

На Беларусі Ц.п. узнікла ў 1914 з уводам у эксплуатацыю Ваўкавыскага цэментнага з-да (гл. *«Ваўкавыскцэментнашыфер»*; з 2001 наз. «Краснасельскбудматэрыялы», г.п. Краснасельскі, Гродзенская вобл.). З 1933 у г. Крычаў (Магілёўская вобл.) працуе цэментны з-д (гл. *«Крычаўцэментнашыфер»*). У 1940 выраблялася каля 200 тыс. т цэменту. У 1996 у г. Касцюковічы (Магілёўская вобл.) пабудаваны *Касцюковіцкі цэментны завод*. Асн. сыравіна — цэментныя карбанатныя і гліністыя пароды з *Каменкаўскага радовішча мелу* (Крычаўскі р-н), *Камунарскага радовішча мергелю і мелу*, радовішча *Пушча* і інш. Вытв-сць цэменту — 1,8 млн. т (2001). *П.І.Рогач.*

ЦЭМЕ́НТНЫ БЕТО́Н, тое, што *цяжкі бетон*.

ЦЭМЕ́НТ-ПУ́ШКА, установа для нанясення распырскваннем бетоннай сумесі на паверхню збудаванняў і канструкцый для атрымання таркрэтбетону, што вызначаецца высокай шчыльнасцю і воданепранікальнасцю. Сухая сумесь з рабочай камеры (барабана) шлангам падаецца ў фарсунку, дзе ўвільгатняецца і вылятае са скорасцю

Да арт. **Цэментная прамысловасць**. Беларускі цэментны завод у г. Касцюковічы.

50—70 м/с. Прадукцыйнасць Ц.-п. 1,5—6 м³/гадз, далёкасць падачы па гарызанталі 200 м, па вертыкалі да 30 м.

ЦЭМЕНТЫ́Т, хімічнае злучэнне жалеза і вугляроду Fe_3C, якое мае ў сабе 6,67% С; фазавая і структурная складальная *жалезавугляродзістых сплаваў*, карбід жалеза (гл. *Карбіды*). Характарызуецца значнай цвёрдасцю і крохкасцю. Выключаецца з вадкага расплаву аўстэніту і ферыту. Уваходзіць у склад *перліту, сарбіту*, траастыту, ледэбурыту і прадуктаў водпуску сталі.

ЦЭМЕ́СКАЯ БУ́ХТА, Новарасійская бухта. У паўн. ч. ўзбярэжжа Чорнага м., утворана Суджукскай касой і мысам Доаб. Даўж. 15 км, шыр. каля ўваходу 9 км, глыб. 21—27 м. Берагі на ПдЗ нізінныя, на ПнУ ўзвышаныя, малапарэзаныя. Упадае р. Цэмес. Восенню і зімой вял. небяспеку для суднаходства ствараюць ураганныя вятры — *бара*. У Ц.б. горад і порт Новарасійск.

ЦЭН НДІ Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь, навукова-даследчая ўстанова, якая існавала ў 1985—94. Гл. *Эканамічны НДІ* Мін-ва эканомікі Рэспублікі Беларусь.

ЦЭНАГЕНЕ́З (ад грэч. kainos новы + ... *генез*), працэс прыстасавання арганізма да спецыфічных умоў эмбрыянальнага ці лічынкавага развіцця. Напр., узнікненне ў жывёл часовых зародкавых органаў — *амніёна, харыёна, алантоіса*, жоўтага мяшка, *плацэнты* і інш.

ЦЭНАЛЕ́СТАВЫЯ, пацукападобныя апосумы (Caenolestidae), сямейства млекакормячых атр. сумчатых. Вядомы з эацэну Паўд. Амерыкі. 3 роды, 7 відаў. Пашыраны ў лясах і гарах (да 4200 м) Паўд. Амерыкі.

Даўж. цела 10—13 см, хваста 6—12 см. Знешне падобныя да пацукоў ці землярыек. Валасяное покрыва шчыльнае і мяккае, на спіне бура-шэрае або цёмна-бурае, на бруху святлейшае. Галава падоўжаная, канічная. Хвост укрыты кароткімі грубымі валаскамі. Канечнасці пяціпальцыя, заднія даўжэйшыя за пярэднія. У маладых самак зрэдку ёсць вывадкавая сумка, у дарослых адсутнічае. Корміцца пераважна беспазваночнымі.



Цэмент-пушка з верхняй (шлюзавай) і ніжняй (рабочай) камерамі.

ЦЭНАЎТВАРЭ́ННЕ, працэс фарміравання і змянення ўзроўняў, суадносін і структуры цэн на тавары і паслугі. Адрозніваюць 2 асн. сістэмы Ц.: рынкавую, што складваецца на аснове ўзаемадзеяння попыту і прапановы, і цэнтралізаваную — на аснове назначэння цэн дзярж. органамі. Аб'ектыўнай асновай *цаны* з'яўляюцца грамадска неабходныя затраты працы, кошт тавараў, якія праз грашовую форму атрымліваюць адлюстраванне ў цане. Прававыя асновы дзярж. палітыкі Рэспублікі Беларусь у галіне Ц. ўстаноўлены Законам «Аб цэнаўтварэнні» ад 10.5.1999. Паводле гэтага закона суб'ектамі Ц. могуць выступаць: юрыд. асобы і прадпрымальнікі; рэсп. органы дзярж. кіравання; абласныя і мінскі гар. выканаўчыя і распарадчыя органы. Асн. прынцыпы Ц.: вызначэнне дзярж. палітыкі ў галіне Ц.; спалучэнне свабодных і рэгулюемых цэн (тарыфаў); размежаванне паўнамоцтваў суб'ектаў Ц. па ўстанаўленні і рэгуляванні цэн (тарыфаў); устанаўленне рэгулюемых цэн (тарыфаў) на тавары (работы, паслугі) на ўзроўні, які забяспечвае суб'ектам гаспадарання пакрыццё эканамічна абгрунтаваных затрат і атрыманне прыбытку, дастатковага для расшыранага ўзнаўлення (з улікам дзярж. датацый і інш. мер дзярж. падтрымкі); дзярж. кантроль за захаваннем дзеючага парадку Ц., устаноўленых нарматываў і рэгулюемых цэн (тарыфаў). У Рэспубліцы Беларусь існуюць таксама свабодныя цэны на тавары (работы, паслугі). Рэгулюемыя цэны выкарыстоўваюцца: на тавары (работы, паслугі) суб'ектаў гаспадарання, якія займаюць дамінуючае становішча на таварных рынках краіны і ўключаны ў дзярж. рэестр; на асобныя сацыяльна значныя тавары (работы, паслугі), канкрэтны пералік якіх устанаўлівае Прэзідэнт дзяржавы або па яго даручэнні ўрад. Дзярж. органы, якія ажыццяўляюць рэгуляванне Ц., маюць права прымаць рашэнне аб выбары канкрэтнага спосабу рэгулявання цэн (тарыфаў), зыходзячы з дзярж. інтарэсаў і сац.-эканам. сітуацыі, якая складваецца ў краіне, у парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Літ.: Фішер С., Дорнбуш Р., Шмалензи Р. Экономика: Пер. с англ. М., 1999. *Ю.Я.Савельеў.*

ЦЭНЗ (лац. census ад censeo раблю вопіс, перапіс), 1) у Стараж. Рыме — перапіс грамадзян з пазначэннем маёмасці для вызначэння іх сац.-паліт., ваен. і падатковага становішча. 2) У сярэдневякоўі ў Зах. і Цэнтр. Еўропе — сял. падаткі, *аброк*, тое, што і *чынш*. 3) Статыстычны перапіс. Гл. таксама *Цэнзы выбарчыя*.

ЦЭНЗ ПРАМЫСЛО́ВАГА ПРАДПРЫЕ́МСТВА, пералік прыкмет, на падставе якіх прадпрыемства ўлічвалася як самаст. гасп. арганізацыя пры стат. перапісах прам-сці ў некаторых краінах, дарэв. Расіі і ў першыя гады сав. улады. У планавай гаспадарцы СССР на ўлік браліся прадпрыемствы, якім быў даведзены план. З сярэдзіны 1930-х г. замест падзелу прам-сці на цэнзавую і няцэнзавую прыняты падзел на буйную і дробную; з пач. 1960-х г. улічваліся прадпрыемствы, якія знаходзіліся на самаст. балансе, і падсобныя.

ЦЭ́НЗАР (лац. censor ад censeo раблю вопіс, перапіс), 1) у Стараж. Рыме адзін з вышэйшых дзярж. саноўнікаў (магістратур). Ц. (былі 2) выбіралі на цэнтурыятных *каміцыях* на 5 гадоў. Яны сачылі за *цэнзам*, мараллю, складалі спісы сенатараў і *коннікаў*. Пасада Ц. з'явілася ў 443 да н.э. Яе займалі выключна *патрыцыі*, з 351 да н.э. права на Ц. дамагліся і *плебеі*. Пры *Суле* Ц. пазбаўлены сваіх правоў, з часоў *Аўгуста* іх паўнамоцтвы перайшлі да імператараў. 2) Службовая асоба, якая ажыццяўляе кантроль (*цэнзуру*) за друкам і сродкамі масавай інфармацыі. *А.Г.Зельскі.*

ЦЭНЗІ́ВА (франц. censive ад позналац. censiva), сялянскае спадчыннае зямельнае трыманне ў Францыі ў 12—18 ст. Пашырылася з 12—13 ст. у сувязі з вызваленнем сялян ад асабістай залежнасці. Цэнзітарый (трымальнік Ц.) штогод выплачваў сеньёру цэнз — грашовую, радзей натуральную рэнту. Ён мог здаць Ц. ў арэнду, прадаць, заложыць, перадаць у спадчыну пры ўмове выплаты асобай пошліны. Як правіла, умовы трымання і памер цэнзу захоўваліся нязменнымі з пакалення ў пакаленне. У час франц. рэвалюцыі 1789—99 Ц. скасавана дэкрэтам Канвента 17.7.1793.

ЦЭНЗУ́РА (лац. censura), сістэма дзярж., духоўнага (царкоўна-рэлігійнага), грамадскага і прыватнага (фінансава-алігархічнага) нагляду і кантролю за друкам і сродкамі масавай інфармацыі (СМІ). Як правіла, вызначае формы і метады ажыццяўлення цэнзурнай палітыкі, прадугледжвае фарміраванне адпаведных заканад.-нарматыўнай базы, структуры органаў і штата служачых — цэнзараў. Узнікла са з'яўленнем дзяржавы. Першая інстытуцыя Ц. — царква. Забарона і публічнае знішчэнне ератычных кніг бярэ пачатак ад першых усяленскіх сабораў. Вынаходніцтва кнігадрукавання прывяло да стварэння адмысловых устаноў Ц. і дакладнага акрэслення іх абавязкаў. Першай з еўрап. краін Ц. ўвяла ў 1502 Іспанія, потым Францыя (1521), Германія (1521), Англія (1530). На Беларусі першымі аб'ектамі ўвагі Ц. былі апокрыфы, некананічная богаслужэбная л-ра, ератычныя трактаты ў Полацкім, Смаленскім, Тураўскім княствах. Палітыку правасл. Ц. ў ВКЛ вызначалі Канстанцінопальскі і Маскоўскі патрыярхаты; каталіцкую Ц. — Ватыкан і манаскія ордэны. У Расіі Ц. зарадзілася ў 16 ст. як духоўная, якую з 1721 ажыццяўляў Сінод. У 19 ст. яна рэгулявалася спец. статутамі і правіламі. На працягу сак. — кастр.

1917 у Расіі была адменена папярэдняя і карная (акрамя ваен.) Ц., ажыццёўлена амаль поўная свабода друку. У розныя перыяды 1917—21 Ц. ў асобных рэгіёнах Беларусі вызначалі ўрады РСФСР, БНР, ССРБ, а таксама Літвы, Украіны, акупац. ўлады Германіі і Польшчы. У 1922 пры Наркамаце асветы БССР створана Гал. ўпраўленне па справах л-ры і выд-ва (Галоўліт), якое на працягу свайго існавання часткова мяняла назву і функцыі; з 19.9.1991 наз. Гал. ўпраўленне па ахове дзярж. тайнаў у друку і інш. сродках масавай інфармацыі пры СМ Рэспублікі Беларусь. У сувязі з прыняццем Закона Рэспублікі Беларусь «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі» (13.1.1995) Ц. адменена (арт. 4). У 20 ст. свабода слова і друку абвешчана ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека (10.12.1948), у канстытуцыях большасці дзяржаў свету, у т.л. Рэспублікі Беларусь (арт. 33).

Літ.: Лемке М.К. Эпоха цензурных реформ, 1859—1865 гг. СПб., 1904; Блюм А.В. Советская цензура в эпоху тотального террора, 1929—1953. СПб., 2000; Ракашевич В.К. Главлит БССР (1923—1991) // Бел. археагр. штогоднік. Мн., 2000. Вып. 1.

ЦЭНЗУ́РНАЯ РЭФО́РМА 1865 у Расіі. Часовыя правілы аб *цэнзуры* і друку, выдадзеныя 18.4.1865, усклалі цэнзуру на Гал. ўпраўленне па справах друку пры Мін-ве ўнутр. спраў (загадвала таксама кніжным гандлем, б-камі, друкарнямі). Ад папярэдняй цэнзуры (да надрукавання) вызваляліся арыгінальныя творы (аб'ёмам больш за 10 друкаваных аркушаў), пераклады (больш за 20 аркушаў), перыяд. выданні ў сталіцах (з дазволу міністра ўнутр. спраў), выданні акадэмій і ун-таў. За парушэнне палажэнняў аб цэнзуры ўводзілася суд. адказнасць і канфіскацыя выданняў. Міністр унутр. спраў мог даваць «папярэджанні» часопісам і газетам за «шкодны кірунак» іх публікацый. Пасля 3-га папярэджання Сенат мог прыпыніць выданне на 6 месяцаў або забараніць яго. З 1868 міністр унутр. спраў мог забараніць рознічны продаж перыяд. выданняў, з 1872 справы аб канфіскацыі выданняў вырашаліся ў адм. парадку.

ЦЭ́НЗЫ ВЫБА́РЧЫЯ, устаноўленыя канстытуцыямі дзяржаў або выбарчым законам умовы для атрымання або ажыццяўлення *выбарчага права*. Існуюць Ц.в.: узроставы, грамадзянства, пісьменства, маёмасны, адукац., аселасці, палавы, нац., расавы, службовы, моўны. Маёмасныя, палавыя, нац., расавыя, моўныя Ц.в. маюць дыскрымінацыйны характар і несумяшчальныя з дэмакр. прынцыпамі выбарчага права. Некаторыя Ц.в. самі не з'яўляюцца дыскрымінацыйнымі, але могуць быць выкарыстаны ў дыскрымінацыйных мэтах (напр., пры празмерным завышэнні цэнзу аселасці). На Беларусі грамадзяне карыстаюцца ўсеагульным, роўным і прамым выбарчым правам. Выключэнні: грамадзяне, прызнаныя судом недзеяздольнымі; асобы, якія ўтрымліваюцца паводле прыгавору суда ў месцах пазбаўлення волі; асобы, у адносінах да якіх у адпаведнасці з крымін.-працэсуальным заканадаўствам выбрана мера стрымання — утрыманне пад вартай. Ц.в. ўзроставы, грамадзянства, службовы дзейнічаюць у пэўных выпадках для асоб, якія выбіраюцца ў выбарныя дзярж. органы. Гл. таксама *Пасіўнае выбарчае права.*

ЦЭНО́З, сукупнасць арганізмаў; гл. ў арт. *Біяцэноз.*

ЦЭНТА́ЎР, Кентаўр (лац. Centaurus), сузор'е Паўд. паўшар'я неба. Найб. яркія зоркі 0,06 і 0,6 візуальнай *зорнай велічыні*. У Ц. знаходзіцца самая блізкая да Сонечнай сістэмы зорка — *Проксіма Цэнтаўра*. З тэр. Беларусі не відаць. Гл. *Зорнае неба.*

ЦЭ́НТНЕР (ням. Zentner ад лац. centenarius які змяшчае 100 адзінак), пазасістэмная адзінка масы. Абазначаецца ц, у краінах з лац. алфавітам *q* (ад quintal).

Адрозніваюць Ц.: метрычны, роўны 100 кг або 0,1 т; брытанскі доўгі, роўны 112 брыт. фунтам або 50,8023 кг; брытанскі кароткі, роўны 100 брыт. фунтам або 45,3592 кг; Ц., які выкарыстоўваецца ў Германіі, Бельгіі, Даніі, Венгрыі і інш. краінах, роўны 50 кг. На Беларусі, Украіне, у Расіі, Польшчы, у ВКЛ у 15—18 ст. адзінку масы, блізкую да 1 ц, наз. корац. У сістэме англ. мер кароткі Ц. меў назву цэнтал (ад лац. centum — сто).

ЦЭНТО́Н (ад лац. cento адзенне ці коўдра з рознакаляровых абрэзкаў), верш, складзены з урыўкаў твораў аднаго ці некалькіх паэтаў. Радкі падбіраюцца так, каб у вершы была пэўная думка, стройная сінтаксічная будова. Як правіла, Ц. уласцівы гумарыстычны паэзіі.

А.А.Майсейчык.

ЦЭНТР (лац. centrum ад грэч. kentron сярэдзінны пункт), 1) пункт перасячэння якіх-н. восей, ліній у фігуры, засяроджання пэўных адносін у целе (напр., *цэнтр інерцыі, цэнтр цяжару*). 2) Сярэдзіна, сярэдняя частка чаго-н. (напр., пасёлка, дзе размешчаны асн. адм. ўстановы). 3) Буйны населены пункт, які мае адм., прамысл., культ. значэнне для якой-н. мясцовасці, краіны (напр., абласны Ц., раённы Ц.). 4) Месца сканцэнтравання якой-н. дзейнасці, органаў кіравання, устаноў, арганізацый, прам-сці, гандлю і інш. (напр., адм. Ц., касм. Ц.). 5) Дэталь у выглядзе стальнога корпуса, прызначанага для падтрымкі загатовак пры іх апрацоўцы на станку.

ЦЭНТР у матэматыцы, 1) Ц. сіметрыі геам. фігуры — пункт перасячэння восей сіметрыі (гл. *Сіметрыя* ў геаметрыі). Крывыя і паверхні, што маюць Ц. сіметрыі, наз. цэнтральнымі. Прыклады цэнтр. крывых — *акружнасць, эліпс, гіпербала*; цэнтр. паверхняў — *сфера, эліпсоід, гіпербалоід*. 2) Ц. падобнасці дзвюх падобных і падобна размешчаных фігур — пункт S, у якім перасякаюцца прамыя, што злучаюць парамі адпаведныя пункты фігур. 3) Адзін з відаў *асаблівых пунктаў* дыферэнцыяльнага ўраўнення.



Цэнтр S падобнасці фігур ABC і A′B′C′ (у матэматыцы).

«ЦЭНТР», група армій (ням. Heersgruppe, аператыўна-стратэгічнае аб'яднанне сухапутных войск фаш. Германіі, якое дзейнічала на цэнтр. участку сав.-герм. фронту (у асн. на тэр. Беларусі) у 1941—44 у Вял. Айч. вайну; найб. моцная з утвораных таксама ў чэрв. 1941 груп «Поўдзень» і «Поўнач», прызначаных для нападу на СССР. Войскі групы «Ц.», якія ўзначаліў ген.-фельдмаршал Ф. фон Бок, пачалі наступленне 22.6.1941 на фронце больш за 500 км ад г. Голдап да г. Уладава (Польшча); мелі ў сваім складзе 2 палявыя арміі, 2 танк. групы (усяго 50 дывізій) і 2 матарызаваныя брыгады; іх падтрымліваў 2-і паветр. флот (каля 1700 баявых самалётаў). Задача групы: акружыць і знішчыць сав. войскі на тэр. Беларусі і стварыць спрыяльныя ўмовы для наступлення на Маскву. Аднак упартая *Брэсцкай крэпасці абарона 1941*, супраціўленне ворагу ў *Навагрудскім «катле»*, *Мінска абарона 1941*, баі на Бярэзіне каля Барысава і Бабруйска, *Магілёва абарона 1941, Віцебска абарона 1941, Гомеля абарона 1941* і інш. садзейнічалі зрыву *«маланкавай вайны»*. У выніку *Смаленскай бітвы 1941* войскі групы армій «Ц.» часова прыпынілі наступленне і перайшлі да абароны, а ў *Маскоўскай бітве 1941—42* пацярпелі паражэнне. Камандуючы фон Бок заменены ген.-фельдмаршалам Г.Г. фон Клюге. Летам і ўвосень 1943 група армій «Ц.» панесла вял. страты (гл. *Курская бітва 1943, Смаленская аперацыя 1943, Гомельска-Рэчыцкая аперацыя 1943*). Зімой 1943—44 група «Ц.» абаранялася на Беларусі: лінія фронту праходзіла на У ад Полацка, Віцебска, Оршы, Магілёва, Жлобіна і далей па р. Прыпяць да г. Ковель Валынскай вобл.; камандаваў арміямі ген.-фельдмаршал Э.Буш. У выніку *Беларускай аперацыі 1944* войскі групы страцілі 17 дывізій і 3 брыгады цалкам, а ў 50 дывізіях — больш за палову свайго складу. 28.6.1944 камандуючым прызначаны ген.-фельдмаршал В.Модэль, з 15.8.1944 — ген.-палк. Рэйнгарт, са студз. 1945 — ген.-палк. Рэндуліч. 26.1.1945 група армій «Ц.» перайменавана ў групу армій «Поўнач», а група армій «А» (існавала ў ліп. 1942 — крас. 1944 і з вер. 1944) — у групу армій «Цэнтр», якая разгромлена ў выніку Вісла-Одэрскай, Берлінскай і Пражскай аперацый.

У.І.Лемяшонак.

ЦЭНТР ГІГІЁНЫ, ЭПІДЭМІЯЛО́ГІІ І ГРАМА́ДСКАГА ЗДАРО́ЎЯ (ЦГЭ і ГЗ), дзяржаўная комплексная сан.-прафілакт. ўстанова, якая ажыццяўляе *санітарны нагляд* і забяспечвае сан.-эпідэміялагічны дабрабыт насельніцтва, прафілактыку захворванняў, сан.-гігіенічны *маніторынг* і інш.

З 2000 у сістэме аховы здароўя Беларусі існуюць рэсп. і абл. ЦГЭ і ГЗ (у іх уключаны цэнтры здароўя і СНІДу), гар. і раённыя, таксама ў некат. ведамасных службах аховы здароўя (усяго 151 у 2003). Дзейнасць ЦГЭ і ГЗ рэгламентуецца законамі Рэспублікі Беларусь, прынятымі ў 2000 «Аб ахове здароўя», «Аб санітарна-эпідэміялагічным дабрабыце насельніцтва», сан. заканадаўствам і інш. Структура: сан.-гігіенічны, эпідэміял. і дэзінфекц. аддзелы; хіміка-аналіт., бактэрыял., радыелагічная і інш. лабараторыі. Праводзяцца лабараторныя і сан.-гігіенічныя даследаванні, мерапрыемствы па прафілактыцы СНІДу, пашырэнні мед. ведаў сярод насельніцтва. Пад кіраўніцтвам ЦГЭ і ГЗ ажыццяўляецца ўзаемадзеянне лячэбных і сан.-прафілакт. устаноў па рэалізацыі праграм аховы здароўя дзяцей, падлеткаў, дарослых, работнікаў прам-сці і інш.

Э.А.Вальчук.

ЦЭНТР ЗАНЯ́ТАСЦІ, першаснае звяно дзярж. службы занятасці. На Беларусі ствараюцца ў раёнах і гарадах. Уведзены ў адпаведнасці з законам «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь» ад 30.5.1991 з мэтай прадухілення беспрацоўя, прадастаўлення сац. і прававых гарантый грамадзянам, якія часова апынуліся без работы, для іх працаўладкавання. Дзейнасць Ц.з. фінансуецца за кошт сродкаў Дзярж. фонду садзейнічання занятасці. Кантроль за рэалізацыяй заканадаўства аб занятасці насельніцтва ажыццяўляюць Саветы дэпутатаў, адпаведныя дзярж. органы і прафсаюзы.

Ю.Я.Савельеў.

ЦЭНТР ЗДАРО́ЎЯ, санітарна-прафілактычная ўстанова, якая ўваходзіць у склад рэсп. і абл. *цэнтраў гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя*. Аказвае асветную, метадычную і прафілакт. дапамогу мед. установам па забеспячэнні санітарна-эпідэміял. дабрабыту. У 20 ст. такія функцыі выконвалі дамы сан. асветы.

ЦЭНТР ІНЁРЦЫІ, цэнтр мас, пункт, месцазнаходжанне якога характарызуе размеркаванне мас у целе ці мех. сістэме. Супадае з пунктам, праз які праходзіць раўнадзейная паралельных *масавых сіл*, прыкладзеных да дадзенай сістэмы, напр., сілы цяжару (гл. *Цэнтр цяжару*).

Радыус-вектар Ц.і. мех. сістэмы, якая складаецца з n матэрыяльных пунктаў, вызначаецца па формуле: $\bar{r}_I = \frac{1}{M}\sum_{i=1}^{n} m_i \bar{r}_i$, дзе $M = \sum_{i=1}^{n} m_i$ — маса ўсёй сістэмы, m_i і $\bar{r}_i$ — маса і радыус-вектар i-га пункта адпаведна. Пры руху сістэмы Ц.і. рухаецца як матэрыяльны пункт з масай, роўнай масе ўсёй сістэмы, на які ўздзейнічаюць усе прыкладзеныя да дадзенай сістэмы знешнія сілы.

ЦЭНТР КІРАВА́ННЯ ПАЛЁТАМІ (ЦКП) касмічных лятальных апаратаў, установа, якая ажыццяўляе цэнтралізаванае аператыўна-тэхн. кіраванне палётам *касмічнага апарата* (КА) з моманту вываду яго на арбіту да заканчэння актыўнага існавання.

Асн. складальная частка ЦКП — інфармацыйна-выліч. комплекс, які прымае, апрацоўвае, аналізуе, адлюстроўвае і дакументуе інфармацыю, што паступае з КА, касмадрома, пошукава-выратавальнага комплексу, наземных вымяральных і плывучых камандна-вымяральных пунктаў з выкарыстаннем сістэм спадарожнікавай сувязі. Непасрэднае кіраванне палётам КА адбываецца са спец. рабочых месцаў, на якія паступае неабходная інфармацыя і якія абсталяваны экранамі касм. тэлебачання і апаратурай для сувязі з касманаўтамі. Рас. ЦКП створаны ў 1973, знаходзіцца ў г. Каралёў Маскоўскай вобл.; узаемадзейнічае з *Цэнтрам падрыхтоўкі касманаўтаў*, НДІ, прадпрыемствамі ракетна-касм. комплексу, аналагічным цэнтрам у ЗША. *У.С.Ларыёнаў.*

ЦЭНТР МАС, тое, што *цэнтр інерцыі*.

ЦЭНТР ПАДРЫХТО́ЎКІ КАСМАНА́ЎТАЎ імя Ю.А.Гагарына (з 1968). Засн. ў 1960. Знаходзіцца ў *Зорным гарадку*. Прызначэнне — адбор і падрыхтоўка касманаўтаў да палётаў на ўсіх тыпах пілатуемых *касмічных апаратаў* па нац. і міжнар. касм. праграмах.

Мае вучэбна-трэніровачную (*баракамеры, сурдакамеры*, тэрмакамеры і інш. трэнажоры, поўнапамерныя макеты касм. караблёў і адсекаў арбітальных станцый і інш.), даследчую, лётную (самалёты і верталёты для ўдасканалення навыкаў пілатавання, мадэліравання стану бязважкасці і інш.) базы. У Цэнтры прайшлі падрыхтоўку (на 1.1.2003) больш за 300 сав. (рас.) касманаўтаў і прадстаўнікоў інш. краін (паводле праграм «Інтэркосмас», «Ёўра-Мір», «Мір-НАСА», «Міжнар. касм. станцыя» і інш.), у т.л. 5 прадстаўнікоў Беларусі (У.В.*Кавалёнак*, П.І.*Клімук*; Б.М.*Белавусаў*, А.І.*Дзядкоў* і А.У.*Шчукін* — гл. Дадатак). Першы нач. Цэнтра — Я.А.Карпаў (1960—63), з 1991 — Клімук.

Літ.: Космическая академия. М., 1987.

У.С.Ларыёнаў.

ЦЭНТР РАДЫЯЦЫ́ЙНАГА КАНТРО́ЛЮ І МАНІТО́РЫНГУ НАВАКО́ЛЬНАГА АСЯРО́ДДЗЯ рэспубліканскі. Створаны ў Мінску ў 1980 як Цэнтр па вывучэнні і кантролі забруджвання прыроднага асяроддзя, з 1991 — Рэсп. цэнтр радыяцыйнага кантролю і маніторынгу прыроднага асяроддзя, з 2001 сучасная назва. Складаецца з аддзелаў: радыяцыйнага маніторынгу, навукова-практычных распрацовак і радыяцыйна-экалагічнай інфармацыі, радыяцыйна-аналітычнага, экалагічнага маніторынгу, аўтаматызаваных сістэм падтрымкі прыняцця рашэнняў, выяўлення і аналізу экстрэмальна высокага забруджвання прыроднага асяроддзя. Ажыццяўляе кантроль за радыяцыйным становішчам на Беларусі, распрацоўвае метады вымярэнняў радыяцыйна-хім. забруджвання, выконвае праектныя, навук. і даследныя работы адпаведна «Дзярж. праграмы Рэспублікі Беларусь па мінімізацыі і пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС», праводзіць назіранні за экалагічным станам атм. паветра, паверхневых вод і глебы. Забяспечвае дзярж. органы, установы і насельніцтва аператыўнай, рэжымнай і прагнастычнай інфармацыяй пра забруджванне навакольнага асяроддзя. Прымае ўдзел у распрацоўцы нарматыўна-прававой базы радыяцыйна-экалагічнага маніторынгу. Вынікі даследаванняў радыяцыйнага становішча і хім. забруджвання на Беларусі падаюцца ў выглядзе карт, штогадовых абагульненых матэрыялаў і бягучай інфармацыі.

М.Р.Гермянчук, В.М.Жукава.

ЦЭНТР ТУРЫ́ЗМУ І КРАЯЗНА́ЎСТВА НАВУЧЭ́НСКАЙ МО́ЛАДЗІ рэспубліканскі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, інструкцыйна-метадычны і арганізац.-масавы цэнтр па турысцкай і краязнаўчай рабоце са школьнікамі, навучэнцамі ПТВ, сярэдніх спец. навуч. устаноў, студэнтамі ВНУ. Створаны ў 1953 у Мінску як Рэсп. дзіцячая экскурсійна-турысцкая станцыя, з 2000 сучасная назва. Каардынуе дзейнасць 55 абл., гар. і раённых пазашкольных устаноў турысцка-краязнаўчага профілю, культ.-асв. і выхаваўчую дзейнасць 1200 грамадскіх музеяў устаноў адукацыі. Рыхтуе і выдае метадычныя матэрыялы, даведнікі, распрацоўвае экскурсійна-турысцкія маршруты, нарматыўныя дакументы па арганізацыі і правядзенні турысцка-краязнаўчай работы з навучэнцамі, павышае кваліфікацыю педагогаў па адпаведным профілі, прымае экскурсійныя групы на турысцкай базе цэнтра. Штогод праводзіць рэсп. турысцкія злёты, спаборніцтвы па пешаходным, веласіпедным і водным турызме, спарт. арыентаванні і скалалажанні, палявыя палатачныя турысцкія лагеры і інш. Ініцыятар правядзення Усебел. турысцка-краязнаўчай экспедыцыі навучэнцаў «Наш край». У гуртках цэнтра займаецца каля 1200 навучэнцаў.

С.С.Мітраховіч.

ЦЭНТР ТЭХНІ́ЧНАЙ ТВО́РЧАСЦІ НАВУЧЭ́НЦАЎ рэспубліканскі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Засн. 10.11.1929 у Мінску як Цэнтр. дзіцячая тэхн. станцыя, з 1945 Дарожная станцыя юных тэхнікаў, з 1961 Цэнтр. станцыя юных тэхнікаў, з 1978 Рэсп. станцыя юных тэхнікаў, з 1991 сучасная назва. Асн. кірункі дзейнасці: метадычная (праграмна-метадычнае забеспячэнне, павышэнне кваліфікацыі педагогаў і інш.), вучэбна-выхаваўчая і масавая (гуртковая работа па тэхн. творчасці, выстаўкі, конкурсы, спаборніцтвы і

інш.). Гуртковая праца з вучнямі арганізавана ў 30 лабараторыях, 130 гуртках па 41 кірунку тэхн. творчасці (радыёэлектроніка, інфарматыка, астраномія, фізіка і тэхналогія металаў, авія-, ракета-, суднамадэліраванне, картынг, радыёспорт, аўтатэхніка, лічбавая фатаграфія і інш.). Мае аддзелы: метадычнай і інфарм.-аналіт. работы, арганізац.-масавай работы і сац. ўзаемадзеяння, навук.-тэхн. творчасці і інфарм. тэхналогій, вытв.-тэхн. творчасці, спартыўна-тэхн., адм.-гасп. работы, а таксама спартыўна-тэхн. комплекс «Вікторыя» з дзіцячай турбазай. *К.І.Цыркун.*

ЦЭНТР ЦЯЖА́РУ цвёрдага цела, пункт, які нязменна звязаны з целам і праз які праходзіць раўнадзейная сіл цяжару, што дзейнічаюць на часцінкі гэтага цела пры любым яго становішчы ў прасторы. Можа знаходзіцца па-за межамі цела, напр., кальца. Месцазнаходжанне Ц.ц. дадзенага цела ў аднародным полі цяжару супадае з месцазнаходжаннем яго *цэнтра інерцыі* Для аднароднага цела, якое мае цэнтр сіметрыі (напр., шара, цыліндра, прамавугольнай ці квадратнай пласцінкі), знаходзіцца ў гэтым цэнтры.

ЦЭНТРАБА́ЛТ, Цэнтральны камітэт Балтыйскага флоту, вышэйшы выбарны орган Саветаў на Балт. флоце Расіі ў 1917—18. Утвораны ў крас. 1917 у г. Гельсінгфорс (цяпер Хельсінкі), старшыня П.Я.*Дыбенка.* Праводзіў палітыку бальшавікоў на флоце, падтрымаў *Кастрычніцкую рэвалюцыю 1917.* Распушчаны ў сак. 1918.

ЦЭНТРАБЕ́ЖНАЯ СІ́ЛА, сіла, з якой *матэрыяльны пункт* уздзейнічае на цела (сувязь), што абмяжоўвае свабоду руху гэтага пункта і прымушае яго рухацца па крывалінейнай траекторыі. Лікава роўная здабытку масы цела на *нармальнае паскарэнне.* Гл. таксама *Сіла інерцыі.*

ЦЭНТРАБЕ́ЖНЫЯ НЕРВО́ВЫЯ ВАЛО́КНЫ, эферэнтныя, маторныя нервовыя валокны, адросткі нерв. клетак (*аксоны*) разам з іх абалонкамі, якія перадаюць узбуджэнне ад *цэнтральнай нервовай сістэмы* да рабочых органаў (мышцаў, залоз). Адрозніваюць чэрапнамазгавыя, спіннамазгавыя і інш. Ц.н.в. адносяцца і да саматычных, і да вегетатыўнах аддзелаў *нервовай сістэмы*; большасць перыферычных *нерваў* з'яўляюцца змешанымі (уключаюць у сябе і *цэнтраімклівыя нервовыя валокны*). У складзе аднаго нерва Ц.н.в. часта праходзяць да некалькіх рабочых органаў. Паводле хуткасці ўзбуджэння Ц.н.в. ў цеплакроўных жывёл падзяляюцца на 3 групы: А (праводзяць узбуджэнне найб. хутка), В і С.

ЦЭНТРАІМКЛІ́ВАЯ СІ́ЛА, сіла, якая абумоўлівае рух *матэрыяльнага пункта* (цела) па крывалінейнай траекторыі; прыкладзена да цела і накіравана ўздоўж гал. нармалі да яго траекторыі ў бок цэнтра крывізны (адсюль назва). Роўная здабытку масы цела на *нармальнае паскарэнне* (пры прамалінейным руху цела роўная нулю).

ЦЭНТРАІМКЛІ́ВЫЯ НЕРВО́ВЫЯ ВАЛО́КНЫ, аферэнтныя, сенсорныя, адчувальныя валокны, адросткі нервовых клетак (*аксоны*) разам з іх абалонкамі, якія перадаюць *узбуджэнне* ад знешніх і ўнутр. *рэцэптараў* у *цэнтральную нервовую сістэму* (да спіннога мозга або да розных аддзелаў галаўнога мозга). Нерв. клеткі размешчаны або ў рэцэптарным органе, або ў спецыфічных адчувальных *гангліях.* Падзяляюцца на зрокавыя, слыхавыя, нюхальныя і інш. Некат. цэнтраімклівыя *нервы* складаюцца з валокнаў розных рэцэптараў (напр., скурныя і мышачныя), большасць — з валокнаў аднаго тыпу адчувальнасці. Уласна цэнтраімклівыя нервы сустракаюцца рэдка, звычайна маюць у сабе і *цэнтрабежныя нервовыя валокны* (змешаныя нервы).

ЦЭНТРАКА́СПІЙ, Цэнтральны камітэт Каспійскай ваеннай флатыліі, вышэйшы выбарны орган рэв. арганізацый маракоў Каспійскай ваен. флатыліі ў 1917—18. Створаны ў 1-й пал. 1917 у Баку. З сак. 1918 узначальваў А.Р.Кузьмінскі. З падзеннем сав. улады ў Баку (гл. *Бакінская камуна*) Ц. фактычна спыніў існаванне, але меншавікі, эсэры і азерб. дзеячы ад яго імя стварылі 1.8.1918 антыбальшавіцкі ўрад, т.зв. Дыктатуру Ц. (існаваў да заняцця Баку ў вер. 1918 тур. войскамі).

ЦЭНТРАЛІЗА́ЦЫЯ, 1) засяроджанне *кіравання* ў адзіным цэнтры, у адных руках. Прадугледжвае стварэнне іерархічных кіраўніцкіх структур, якія кантралююць выкарыстанне матэрыяльных, прыродных, фін., інтэлектуальных і інш. рэсурсаў грамадства, а таму нясуць адказнасць за падтрыманне належнага ўзроўню бяспекі ў краіне і выпрацоўку адпаведных рашэнняў. Працэс паслаблення або ліквідацыі Ц. наз. *дэцэнтралізацыяй.* 2) Ц. капіталу — рост велічыні *капіталу* шляхам аб'яднання банкаў і інш. грашова-крэдытных устаноў у буйныя фін. карпарацыі, якія выходзяць па-за нац. межы і ўплываюць на міжнар. фін. палітыку.

В.І.Боўш.

ЦЭНТРАЛІ́ЗМ, сістэма кіравання, заснаваная на прынцыпе безумоўнага падпарадкавання мясц., перыферыйных органаў улады вышэйшым, размешчаным ў адным цэнтры. Выкарыстоўваецца ў дзярж. рэгуляванні эканомікай, у дзейнасці паліт. партый, грамадскіх арг-цый і заключаецца ў засяроджанні ўладных і кіраўніцкіх паўнамоцтваў у адзіным вышэйшым цэнтры (манарх, прэзідэнт, кіраўнік урада, федэрацыя, мін-ва, к-т, кіраўніцтва карпарацыі, праўленне, рада паліт. партыі, грамадскай арг-цыі). Выступае ў дэмакр., бюракратычнай, канстытуцыйнай і інш. формах, якія адрозніваюцца паводле крытэрыя размеркавання ўлады паміж цэнтрам і перыферыяй, а таксама паводле характару адносін паміж імі, што замацоўваецца ў канстытуцыях, законах, статутах, палажэннях і на практыцы. Адметная рыса дэмакр. Ц. — спалучэнне падпарадкавання вышэйшым органам і агульнай дысцыпліне з прызнаннем канструктыўных ініцыятыў з месцаў і рэгіёнаў, права апошніх прымаць удзел у выпрацоўцы важных паліт. рашэнняў, у выбарах кіруючых органаў і інш. *В.І.Боўш.*

ЦЭНТРАЛЬНААМЕРЫКА́НСКІ ЖО́ЛАБ, глыбакаводны жолаб у Ціхім ак., уздоўж зах. берага Цэнтр. Амерыкі. Даўж. 2530 км, сярэдняя шыр. 34 км. На ПнЗ жолаб выкліньваецца каля 20 ° паўн. ш., на ПдУ заканчваецца каля падножжа падводнага хр. Кокас. Вузкае плоскае дно Ц.ж. падзелена невысокімі парогамі на некалькі катлавін з глыб. 4500—6500 м (макс. — 6639 м).

ЦЭНТРАЛЬНААНДЫ́ЙСКАЕ НАГО́Р'Е, найб. шырокая (да 750 м) частка Андаў паміж 15 і 28 ° паўд. ш. на тэр. Перу, Балівіі, Аргенціны і Чылі. Цэнтр. ч. займаюць унутр. пласкагор'е Пуна (выш. 3700—4100 м, з асобнымі хрыбтамі да 6000 м) і паніжаная раўніна *Альтыплана.* На У Пуна акаймавана Кардыльерай-Рэаль (выш. 6550 м), на З — Зах. Кардыльерай Андаў (г. Охас-дэль-Салада, 6885 м), у якой уздымаюцца сотні патухлых і дзеючых вулканаў.

Пласкагор'е складзена з палеазойскіх блокаў, перакрытых кайназойскімі вулканічнымі, алювіяльнымі і калювіяльнымі адкладамі. Радовішчы руд волава, вальфраму, сурмы, медзі, жалеза, вісмуту, серабра і інш. Клімат трапічны высакагорны, на ўсх. наветраных схілах вільготны (1000—3000 мм ападкаў за год), у Пуне і на З рэзка кантынентальны, засушлівы і сухі, месцамі менш за 200 мм за год. Сярэднія месячныя т-ры — 4—10 °. Моцныя вятры. Пуна — вобласць унутр. сцёку, пераважна ў азёры Тытыкака і Паапо. Рэкі невял., на З часовыя вадацёкі. Шмат буйных саланчакоў — салараў. На ўсх. схілах горна-трапічныя ўмерана вільготныя лясы. На Пн і ПнУ высакагорныя стэпы (кавыль, аўсяніца, вейнік, кактусы); развіта пашавая жывёлагадоўля, да выш. 4000 м пасевы збожжавых і бульбы. На З і Пд пустыні (тола) і паўпустыні. У паўн. ч. Пуны водзяцца дзікія віды лам гуанака і вігонь (вікунья), рэліктавы мядзведзь-акулярнік, азарава лісіца, шмат вадаплаўных птушак, грызуноў, у т.л. шыншыла.

Літ.: Лукашова Е.Н. Южная Америка. М., 1958; Галай И.П., Жучкевич В.А., Рылюк Г.Я. Физическая география материков и океанов. Мн., 1988. *М.В.Лаўрыновіч.*

ЦЭНТРАЛЬНААФРЫКА́НСКАЯ РЭСПУ́БЛІКА (République Centrafricaine), ЦАР, дзяржава ў Цэнтр. Афрыцы. Мя-

жуе на З і ПдЗ з Камерунам, на Пд — з Рэспублікай Конга і Дэмакр. Рэспублікай Конга, на ПнЗ — з Рэспублікай Чад, на ПнУ — з Суданам. Пл. 623 тыс. км^2. Нас. 3642 тыс. чал. (2002). Афіц. мова — французская, найб. пашырана — санго. Сталіца — г. *Бангі*. Падзяляецца на 16 прэфектур. Нац. свята — Дзень абвяшчэння рэспублікі (1 снежня).

Герб і сцяг **Цэнтральнаафрыканскай Рэспублікі.**

Дзяржаўны лад. Ц.Р. — рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1994. Кіраўнік дзяржавы — прэзідэнт, які выбіраецца ўсеагульным прамым галасаваннем на 6 гадоў. Заканад. ўлада належыць Нац. сходу — парламенту (85 дэпутатаў, выбіраюцца на 5 гадоў). Выканаўчую ўладу ажыццяўляюць прэзідэнт і ўрад.

Прырода. Большая ч. тэр. занята ўзв. Азандэ (сярэднія выш. 600—900 м). Над ім узвышаюцца астанцовыя граніт-ныя масівы Ядэ на З і Фертыт на У (выш. да 1388 м, г. Нгая). На Пн узвышша паступова пераходзіць у забалочаную раўніну паўд. ускраіны ўпадзіны Чад. Карысныя выкапні: алмазы, уранавыя, медныя, жал., нікелевыя і кобальтавыя руды, нафта. Клімат экватарыяльны мусонны, гарачы. Сярэднія т-ры самага цёплага месяца (ліп.) у г. Бангі 31 °С, самага халоднага (студз.) 21 °С. Гадавая колькасць ападкаў ад 1000—1200 мм на Пн да 1500—1600 мм на Пд. Гал. рэкі — Убангі, Санга (бас. р. Конга), на Пн рэкі сістэмы Шары (Уам, Грыбінгі). У расл. покрыве пераважаюць высакатраўныя саванны і рэдкастойныя лістападныя і вечназялёныя лясы (сырнае дрэва, тамарынд, барасавая пальма) на чырв. латэрытных глебах. Уздоўж рэк — галерэйныя лясы, на Пд вільготнаэкватарыяльныя лясы з каштоўнай драўнінай (чорнае, чырв. дрэва) на чырвона-жоўтых латэрытных глебах. У складзе жывёльнага свету шмат млекакормячых (слоны, насарогі, буйвалы, антылопы, жырафы, малпы); з драпежнікаў — ільвы, леапарды, гіены; у рэках — гіпапатамы, кракадзілы; птушкі, змеі, яшчаркі, насякомыя, у т.л. муха цэцэ. Нац. паркі: Андрэ-Фелікс, Бамінгі-Бангоран, Сен-Флорыс і інш.

Насельніцтва. Большасць насельніцтва належыць да банту і адамаўа-ўсх. моўных падгруп. Паўсюдна жывуць байя (33%), банда (27%), манджыа (13%), на Пн — сара (10%), уздоўж р. Убангі — бубангі, на З — зандэ, у лясных раёнах — пігмеі бінга і інш. Еўрапейцаў 6,5 тыс. чал., у т.л. 3,6 тыс. французаў. Сярод вернікаў прыхільнікаў мясц. традыц. вераванняў 35%, пратэстантаў і католікаў па 25%, мусульман 15% (2002). Сярэдняя шчыльн. 5,8 чал. на 1 км^2. Больш заселены паўд. і паўд.-зах. раёны — каля 10 чал. на 1 км^2. Натуральны прырост 1,9%. Гар. насельніцтва 20%. Найб. гарады (тыс. ж., 1990): Бангі — 706, Бамбары — 50, Бербераты — 42, Буар — 40, Басангоа — 32.

Гаспадарка. ЦАР — слабаразвітая агр. краіна. Валавы ўнутр. прадукт (ВУП) 4,6 млрд. дол., каля 1,3 тыс. дол. на 1 чал. (2001). У структуры ВУП доля сельскай гаспадаркі — 55%, прам-сці — 20%, сферы паслуг — 25%. Вял. роля ў эканоміцы, пераважна ў сельскай і лясной гаспадарцы, горназдабыўной прам-сці, належыць замежнаму капіталу, у асн. французскаму. У сельскай гаспадарцы занята 80% эканамічна актыўнага насельніцтва. Апрацоўваецца 3,1% тэр. (1931 тыс. га). Пераважаюць дробныя натуральныя сялянскія гаспадаркі. Асн. экспартныя культуры: баваўна (збор 37 тыс. т), кава (12,4 тыс. т), тытунь (618 т). Для ўнутр. спажывання вырошчваюць маніёк, кукурузу, на Пн — сорга і проса, у далінах рэк Кота і Лабас — рыс. Прыгараднае агародніцтва (гарбузы, фасоля, таматы) і садоўніцтва (манга, авакада, папайя, цытрусавыя). Жывёлагадоўля адгоннакачавая, малапрадукцыйная, ёй шкодзіць муха цэцэ. Гадуюць (млн. галоў, 1997) буйн. раг. жывёлу (2,99), коз (2,35), свіней (0,6), авечак (0,2), курэй (3,9). Улоў рыбы 12,9 тыс. т (1999). Штогод нарыхтоўваюць больш за 200 тыс. м^3 драўніны каштоўных парод. Прам-сць развіта слаба. Здабыча алмазаў (каля 430 тыс. каратаў штогод) і золата (каля 190 кг). Апрацоўка алмазаў (5% аб'ёму) у г. Бангі. У краіне каля 130 прамысл. прадпрыемстваў, пераважна па перапрацоўцы с.-г. сыравіны. Вылучаюцца тэкст. (баваўняны камбінат, абутковая і швейная ф-кі ў г. Бангі, першасная апрацоўка бавоўны ў гарадах Бамбары, Басангоа, Грымары) і харч. (алейная, мукамольная, піваварная, тытунёвая) прам-сць. Ёсць лесаапр., металаапр., зборачныя (радыёпрыёмнікі, веласіпеды) і хім. прадпрыемствы. Вытв-сць электраэнергіі 104 млн. кВт·гадз (2000), пераважна на ГЭС (Боалі-1 і Боалі-2 на р.Мбалі). Транспарт аўтамаб., водны, паветраны. Чыгунак няма. Даўж. аўтадарог 23,8 тыс. км, у т.л. 429 км з асфальтаваным пакрыццём (2000), водных шляхоў — 900 км. Гал. рачны порт і міжнар. аэрапорт — Бангі. Экспарт (166 млн. дол., 2000) алмазаў (54%), драўніны (16%), бавоўны, кавы, тытуню. Імпарт (154 млн. дол., 2000) харч. прадуктаў, тэкстылю, нафтапрадуктаў, машын і абсталявання, хімікатаў, медыкаментаў і інш. Асн. гандл. партнёры: Францыя, краіны Бенілюкс, Германія, Камерун, Японія, Кот-д'Івуар. Грашовая адзінка — франк КФА (Афр. фін. т-ва).

Гісторыя. Гісторыя ЦАР да еўрап. каланізацыі вывучана слаба. У 16 ст. яе тэр. ў складзе дзяржавы Гаога, у 17—19 ст. — дзяржаў Вадаі, Багірмі і *Рабаха дзяржавы*. У 1889 сюды пранікла франц. ваен. экспедыцыя, якая засн. форт Бангі; да пач. 20 ст. Францыя падпарадкавала ўсе гэтыя землі. У 1904—14 тэр. ЦАР у складзе калоніі Убангі-Шары—Чад, пасля аддзялення ў 1914 Чада — асобная калонія Убангі-Шары ў складзе Франц. Экватарыяльнай Афрыкі, з 1946 — «заморская тэрыторыя» Францыі. У 1949 створаны Рух сац. эвалюцыі Чорнай Афрыкі (МЕСАН), прадстаўнікі якога ў 1957 узначалілі першы афр. ўрад Убангі-Шары. 1.12.1958 Убангі-Шары пад назвай ЦАР абвешчана аўт. дзяржавай у складзе Франц. *Супольніцтва*. У 1959 прынята 1-я канстытуцыя ЦАР. З 13.8.1960 ЦАР — незалежная дзяржава на чале з лідэрам МЕСАН Д.Дако. У 1962 забаронены ўсе палітычныя партыі, акрамя МЕСАН. У выніку дзярж. перавароту 1.1.1966 уладу захапіў палк. Ж.Б.Бакаса; распушчаны парламент і скасавана канстытуцыя. У 1976 ЦАР абвешчана Цэнтр.-Афр. імперыяй, а Бакаса — імператарам. Жорсткія рэпрэсіі, у прыватнасці, забойства больш як 100 школьнікаў у Бангі, прывялі да ўмяшання Францыі, з дапамогай якой Бакаса ў кастр. 1979 скінуты, адноўлена рэспубліка на чале з прэзідэнтам Дако. У лют. 1981 прынята новая канстытуцыя ЦАР. У выніку дзярж. перавароту 1.9.1981 улада перайшла да Ваен. к-та Нац. адраджэння на чале з ген. А.Калінгбам (з 1984 прэзідэнт ЦАР).

У пач. 1990-х г. пачалася дэмакратызацыя паліт. рэжыму, дазволена шматпартыйнасць. На першых шматпарт. выбарах 1993 прэзідэнтам ЦАР выбраны А.Ф.Патасе (у 1998 перавыбраны на 2-і тэрмін). У 1994 прынята новая канстытуцыя ЦАР. Тым не менш, унутры-

паліт. становішча ЦАР заставалася няўстойлівым. У сак. 2003 урад Патасе скінуты паўстанцамі на чале з ген. Ф.Базізе.

У краіне дзейнічаюць паліт. партыі: Рух за вызваленне цэнтральнаафр. народа, Альянс за дэмакратыю і прагрэс, Цэнтральнаафр. дэмакр. аб'яднанне. Асн. прафсаюзы: Прафс. аб'яднанне цэнтральнаафр. працоўных і Арг-цыя свабодных прафсаюзаў служачых дзярж. сектара. ЦАР — чл. ААН (з 1960), Афр. саюза (з 2002).

З.М.Шуканава (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *В.У.Адзярыха* (гісторыя).

Да арт. **Цэнтральнаафрыканская Рэспубліка**. Вадаспад на р. Мбалі.

ЦЭНТРАЛЬНАБЕЛАРУ́СКІ МАСІ́Ў, найбольш прыўзнятая частка *Беларускай антэклізы* на У Гродзенскай і З Мінскай абласцей. Абмежаваны на ПнУ Налібоцкім, на Пд Свіслацкім і Ляхавіцкім разломамі і серыяй паўн. прыбартавых разломаў Прыпяцкага прагіну, на З — ізагіпсай паверхні фундамента 200 м. Мае форму кліна, даўж. 230 км, шыр. асновы 160 км. Паверхня крышт. фундамента ў цэнтр. і ўсх. частках прыўзнята на Бабаўнянскім выступе, месцамі выходзіць пад антрапагенавую тоўшчу. Уяўляе сабой сістэму блокавых падняццяў фундамента, перакрытых платформавым чахлом з познапратэразойскіх, мелавых, палеагенавых, неагенавых і антрапагенавых адкладаў. Паводле часу фарміравання Ц.м. як часткі Бел. антэклізы — структура вендскага залажэння; як самаст. выступ у складзе *Балтыйскага шчыта* яна існавала ў валынскі час.

ЦЭНТРАЛЬНАБЕЛАРУ́СКІЯ КРАЯВЫ́Я ЛЕДАВІКО́ВЫЯ ЎЗВЫ́ШШЫ І ГРА́ДЫ, геамарфалагічная вобласць у цэнтр. частцы Беларусі (паводле *геамарфалагічнага раянавання* А.В.Мацвеева, 1988). Мяжуе з геамарфалагічнымі абласцямі *Беларускага Паазер'я* на Пн і *Перадпалесся* на Пд. Падзяляецца на Заходнє- і Усходнє-Бел. падвобласці і 19 геамарфалагічных раёнаў: Гродзенскае, Мінскае, Ваўкавыскае, Слонімскае і Навагрудскае краявыя ледавіковыя ўзвышшы, Скідзельская ледавікова-азёрная нізіна, Любчанская водна-ледавіковая нізіна, Лідская і Стаўбцоўская марэнныя раўніны, даліна Нёмана, Воранаўская водна-ледавіковая раўніна з краявымі ледавіковымі ўтварэннямі, Ашмянскія і Капыльскія краявыя ледавіковыя грады, Вілейская марэнная водна-ледавіковая нізіна, Крывіцкая марэнная раўніна з краявымі ледавіковымі ўтварэннямі (Зах.-Бел. падвобласць) і Верхнебярэзінская водна-ледавіковая раўніна, Лукомскае і Аршанскае краявыя ледавіковыя ўзвышшы, Горацкая марэнная раўніна з краявымі ледавіковымі ўтварэннямі (Усх.-Бел. падвобласць).

Рэгіён характарызуецца развіццём найб. значных краявых ледавіковых утварэнняў сожскага ледавіковага покрыва (гл. *Сожскае зледзяненне*). Пераважае дэнудацыйны градава-ўзгорысты рэльеф з пакатымі вяршынямі і глыбокім эразійным расчляненнем. Шмат дэнудацыйных лагчын і скразных далін. На краявых утварэннях часта залягаюць лёсападобныя пароды, дзе пашыраны шматлікія яры і суфазійныя западзіны. Азёрныя і інш. катлавіны трапляюцца рэдка. Рэкі з добра аформленымі далінамі, трапляюцца таксама вузкія і глыбокія з камяністым дном і парогамі. Пераважаюць выш. 200—250 м, найвыш. і макс. для Беларусі — 342 і 345 м (*Лысая гара* і *Дзяржынская гара*). Падвобласці з рознай структурна-тэктанічнай будовай: зах. ч. вобласці прымеркавана да *Беларускай антэклізы*, усх. — да *Аршанскай упадзіны*, што праявілася ў асаблівасцях даледавіковага і ледавіковага рэльефу і дынамікі ледавікоў. Для Зах.-Бел. падвобласці характэрны вял. абс. і адносныя вышыні, разнастайнасць ледавіковых форм, сярод якіх многія абумоўлены праяўленнем гляцыядыслакацый. У межах Усх.-Бел. падвобласці рэльеф набыў платопадобны характар, зніжаны абс. вышыні і зменшана гарыз. і верт. расчлянёнасць.

Літ.: Матвеев А.В., Гурский Б.Н., Левицкая Р.И. Рельеф Белоруссии. Мн., 1988.

А.В.Мацвееў.

ЦЭНТРАЛЬНАБЯРЭ́ЗІНСКАЯ РАЎНІ́НА, фізіка-геагр. раён *Перадпалескай правінцыі*, у цэнтры Беларусі. Займае ўсх. ч. Мінскай, зах. Магілёўскай, паўн. Гомельскай абласцей. Мяжуе з Мінскім і Аршанскім узвышшамі на ПнЗ і Пн, Аршанска-Магілёўскай і Чачорскай раўнінамі на ПнУ і У, Беларускім Палессем на Пд і Капыльскай градой з прылеглымі да яе раўнінамі на З. Выш. 150—180 м. Працягнулася з Пн на Пд на 165 км, а З на У на 90—170 км. Пл. 28,1 тыс. км^2.

Ц.р. прымеркавана да ўсх. схілаў *Беларускай антэклізы* і паўд.-зах. часткі *Аршанскай упадзіны*. У платформавым чахле найб. пашыраны адклады верхняга пратэразою, палеазою (пераважна дэвону), мезазою і кайназою. Пароды антрапагену (бярэзінскага, дняпроўскага, сожскага і паазерскага зледзяненняў) складаюць покрыва магутнасцю 40—130 м. На паверхні раўніны пашыраны водна-ледавіковыя розназярністыя пяскі з галькай і дробнымі валунамі, супескі, месцамі марэнныя адклады, на ўзвышаных участках лёсападобныя пароды, у далінах рэк алювіяльныя пяскі, у забалочаных паніжэннях торф і інш.

Цэнтральнабярэзінская раўніна. Краявід у Бабруйскім раёне Магілёўскай вобласці.

Рэльеф сфарміраваўся пад уплывам *сожскага зледзянення*. Паверхня пласкахвалістая, паніжаецца на Пд, дзе абс. адзнакі на 20—30 м ніжэй, чым на Пн. Пашыраны зандравыя раўніны, асабліва ў міжрэччы Друці і Бярэзіны. Развіты дзюнна-ўзгорысты рэльеф, другасныя марэнныя раўніны з плоскай паверхняй. Трапляюцца размытыя краявыя грады, найб. выразныя каля гарадоў Бабруйск, Любань, Асіповічы. Пашыраны лагчыны сцёку расталых ледавіковых вод, затарфаваныя катлавіны. Шматлікія рачныя даліны маюць поймавыя і да 2 надпоймавых тэрас, схілы парэзаны ярамі. Найб. рэкі Дняпро з Друццю, Бярэзіна з прытокамі, Пціч, вярхоўі Арэсы і Случы (з Мораччу). Азёры невял. (Судабле, Сяргееўскае), у поймах шмат старычных азёр. На міжрэччах балоты вярховыя і пераходныя, у далінах рэк і паніжэннях — нізінныя. Вадасховішчы: Чырвонаслабодскае на р. Морач, Салігорскае на р. Случ, Любанскае на р. Арэса, Чыгірынскае на р. Друць і Асіповіцкае на р. Свіслач. Карысныя выкапні: калійныя і каменная солі, легкаплаўкія гліны, пяскі сілікатныя і буд., пясчана-жвіровы матэрыял, мел, сапрапель, торф, мінер. воды. Глебы дзярнова-падзолістыя, у паніжэннях — тарфяна-балотныя, па далінах — алювіяльныя. Пад лесам 41%. Найб. пашыраны хваёвыя і шыракаліста-хваёвыя лясы. Трапляюцца яловыя, дубовыя, грабавыя, чорнаальховыя, асінавыя, бярозавыя лясы і рэдкія на Беларусі ліпнякі. Па далінах рэк разнатраўныя лугі. Пад ворывам больш за 30% тэр. У межах раўніны заказнікі: гідралагічны — *Заазер'е*, біял. — *Амяльнянскі, Дзянісавіцкі*, Кайкаўскі, *Копыш, Мацеевіцкае, Струменскі, Чачэрскі, Чэрнеўскі, Фаліцкі Мох*. *Л.У.Мар'іна.*

ЦЭНТРА́ЛЬНАЕ БЮРО́ КП(б)Б [ЦБ КП(б)Б], вышэйшы кіруючы орган Кампартыі Беларусі паміж з'ездамі са снеж. 1918 да сак. 1919 і з вер. 1920 да лют. 1924. З сак. 1919 да вер. 1920 КП(б)Б была аб'яднана з КП(б) Літвы і Беларусі. Выбіралася з'ездам для ажыццяўлення паліт., гасп. і культ. кіраўніцтва ў рэспубліцы, рэалізацыі рашэнняў з'ездаў РКП(б) і КП(б)Б. Мела Сакратарыят і Прэзідыум, з лют. да мая 1924 у сувязі з правядзеннем *узбуйнення БССР* замест ЦБ існавала *Часовае Беларускае Бюро ЦК РКП(б)*. VIII з'езд КП(б)Б (12—14.5.1924) выбраў ЦК КП(б)Б (гл. *Цэнтральны Камітэт КПБ*).

ЦЭНТРА́ЛЬНАЕ БЮРО́ КРАЯЗНА́ЎСТВА, грамадскі орган па кіраўніцтве краязнаўчым рухам на Беларусі ў 1920—30-я г. Дзейнічала з 1923 пры Інбелкульце, у 1929—36 пры АН Беларусі. Старшыні М.І.Бялуга, В.А.Серафімаў, адказны сакратар С.В.Скандракоў, навук. сакратары М.І.Каспяровіч, В.А.Самцэвіч і інш. У бюро працавалі М.Азбукін, К.Крапіва, В.Пераход, У.Пічэта, А.Фядзюшын. Вывучала формы, метады і кірункі краязнаўчай работы, вяла ўлік краязнаўчых т-ваў і гурткоў, аказвала ім метадычную дапамогу, забяспечвала лрай і бібліягр. інфармацыяй, каардынавала іх дзейнасць з дзярж. навук. арг-цыямі. Шырока прапагандавала краязнаўчую работу. Садзейнічала падрыхтоўцы краязнаўчых кадраў: праводзіла іх вучобу на спец. курсах, распрацавала план курса па краязнаўстве для ВНУ і тэхнікумаў. З кастр. 1925 выдавала час. «*Наш край*» (у 1930—33 наз. «Савецкая краіна»), зб-кі, дзе змяшчаліся матэрыялы краязнаўчых з'ездаў і канферэнцый, рэцэнзіі на краязнаўчыя выданні, праграмы і інструкцыі.

Літ.: Амелькович Л.Г. Деятельность Центрального Бюро краеведения Белоруссии (1923—1933 гг.) // Вопросы библиотековедения и библиографоведения. Мн., 1975.

Л.Г.Амяльковіч.

ЦЭНТРА́ЛЬНАЕ БЮРО́ ПРАЛЕТА́РСКАГА СТУДЭ́НЦТВА, ЦБ Пралетстуда, кіраўнічы орган бел. студэнцтва ў 1923—32. Створана ў вер. 1923 у Мінску як Бел. бюро пралетарскага студэнцтва, з 1926 — ЦБ Пралетстуда. У яго ўваходзілі Віцебскае, Магілёўскае і Гомельскае гарбюро. Аб'ядноўвала прафкомы і выканаўчыя бюро прафс. секцый ВНУ, тэхнікумаў, рабфакаў і саўпартшкол Беларусі, бел. студэнцкіх зямляцтваў ВНУ СССР. ЦБ (15 членаў і 5 кандыдатаў) выбіралася на канферэнцыях, кіравалася прэзідыумам (5 членаў і 2 кандыдаты). Працу вяло праз арганізац., акад., культ.-асв. і эканам. камісіі. У розныя гады прафсаюзамі было ахоплена ад 25 да 52% студэнтаў; пры паступленні ў іх улічваўся сац. статус і праводзіўся паліт. экзамен. Звычайна прымалі студэнтаў старэйшых курсаў, актывістаў грамадскай дзейнасці. Студэнцкія прафс. арг-цыі, што ўваходзілі ў ЦБ Пралетстуда, будаваліся паводле вытв. прынцыпу (за выключэннем рабфакаў). Яны ўдзельнічалі ва ўсіх кампаніях, што праводзіла партыя (ліквідацыя непісьменнасці, калектывізацыя, арганізацыя сацспаборніцтва і інш.). Ва ўмовах усталявання адм.-камандна-сістэмы ЦБ праяўляла актыўнасць у барацьбе з «праявамі чужой ідэалогіі», у ачышчэнні «ад сацыяльна чужога элементу», «пралетарызацыі» навуч. устаноў. Для яго дзейнасці характэрны фармалізм, адсутнасць рэальнага дэмакратызму. Працай Бел. бюро кіравала, акрамя ЦСПСБ і галіновых прафсаюзаў, яшчэ і Маскоўскае Цэнтр. бюро Пралетстуда пры ВЦСПС. У 1925 ЦБ выпускала час. «Чырвоны сцяг», у 1929—30 — радыёгазету «Чырвоны студэнт». Паводле пастановы прэзідыума ВЦСПС ад 1.7.1932 функцыі па працы сярод студэнцтва перададзены Аргбюро студэнцкіх секцый ЦСПСБ (існавала да 1.6.1937). *А.М.Гесь.*

ЦЭНТРА́ЛЬНАЕ РАЗВЕ́ДВАЛЬНАЕ ЎПРАЎЛЕ́ННЕ (ЦРУ; Central Intelligence Agency — CIA), каардынуючы цэнтр цывільнай і ваен. разведкі, асноўны орган стратэг. разведкі ЗША, які ажыццяўляе сваю дзейнасць на правах самаст. развед. ведамства. Створана ў 1947. Узначальвае дырэктар ЦРУ, які падпарадкоўваецца непасрэдна прэзідэнту ЗША. Пад яго кантролем распрацоўваецца бюджэт нац. разведкі, рыхтуецца важнейшая развед. інфармацыя для вышэйшага ваен.-паліт. кіраўніцтва краіны. ЦРУ налічвае 15—18 тыс. супрацоўнікаў у цэнтры, 4—5 тыс. за межамі краіны і тысячы агентаў унутры краіны; больш за 100 рэзідэнтур і рэгіянальных апорных цэнтраў за мяжой, а таксама шэраг аб'ектаў на тэр. ЗША. Гадавы бюджэт больш за 3 млрд. дол. Для вядзення разведкі ЦРУ апрача свайго апарата выкарыстоўвае прадстаўнікоў інш. ведамстваў і арг-цый, цесна супрацоўнічае з развед. службамі шэрагу інш. дзяржаў, найперш членаў блока НАТО.

Літ.: ЦРУ глазами американцев: Сб. материалов зарубежной прессы. 2 изд. М., 1977; Проблемы конституционализма. Вып. 6. Специальные службы в условиях конституционной демократии: Республика Беларусь и междунар. опыт. Мн., 1999.

ЦЭНТРАЛЬНАЕЎРААЗІЯ́ЦКАЯ ПЛАТФО́РМА, найбольш буйная маладая платформа ў цэнтры Еўразіі, паміж *Усходне-Еўрапейскай платформай* і *Сібірскай платформай*. Пл. 6,5 млн. км^2. На Пд мяжуе з Альпійскай складкавай вобласцю. Фундамент гетэрагенны, складзены з каледонскіх, герцынскіх, радзей байкальскіх і кімерыйскіх складкавых збудаванняў, сярод якіх блокі (мікракантыненты) архею і ніжняга пратэразою. Фундамент выходзіць на паверхню ў межах Цэнтральнаказахстанскага шчыта, Уральскага хрыбта, кражаў — Вял. Каратау, Султануіздаг, Данецкі і інш. Гал. плошчу платформы займаюць пліты: Зах.-Сібірская, Туранская, Скіфская (гл. адпаведныя артыкулы) і Мізійская. Яны складзены з платформавага чахла, які пачынаецца з верхнетрыясавых, часцей юрскіх адкладаў. На больш стараж. блоках фундамента пашыраны венд-палеазойскі прамежкавы чахол.

Сярод тэктанічных элементаў вылучаюцца сінеклізы (Ханты-Мансійская, Чуйская), упадзіны (Омская, Барсакельмеская), прагіны (Худасейскі, Чалкарскі), скляпенні (Ніжнявартаўскае, Цэнтральнакаракумскае), зоны мегантыкліналей і мегасінкліналей (Мангышлакская, Ейска-Беразанская), мульды, падняцці, зоны ступеней, седлавіны, монакліналі, саляныя структуры і інш. У ніжняй ч. платформавага чахла развіты трыяс-юрскія грабены — тафрагены (Калтагорскі, Урэнгойскі, Чэлябінскі). З плітамі звязаны буйныя радовішчы нафты і газу, са шчытамі, хрыбтамі, кражамі — разнастайныя радовішчы метал. руд.

Літ.: Гарецкий Р.Г. Тектоника молодых платформ Евразии. М., 1972. *Р.Г.Гарэцкі.*

ЦЭНТРАЛЬНАЕЎРАПЕ́ЙСКІ НАФТАГАЗАНО́СНЫ БАСЕ́ЙН. Размешчаны на тэр. Вялікабрытаніі, Бельгіі, Нідэрландаў, Даніі, Германіі, Польшчы, у зах. раёнах Латвіі, Літвы, Расіі, Беларусі, Украіны, Швецыі (в-аў Готланд), на шэльфах Паўн. і Балт. мораў. Пл. 1028 тыс. км^2, у т.л. 533 тыс. км^2 на акваторыі. Пачатковыя прамысл. запасы (1989): 2042 млн. т нафты і 4406 млрд. м^3 газу (без усх.-еўрап. краін). Пошукава-разведачныя работы ў басейне вядуцца з канца 19 ст. (на тэр. Германіі).

Першае радовішча нафты (Нінхаген) адкрыта ў 1870, газавае (Бентгайм) у 1938. У пач. 1990-х г. выяўлена 437 радовішчаў (224 нафтавыя і 213 газавых). Буйнейшыя нафтавыя радовішчы — Статфіёрд, Фортыс, Экафіск, Брэнт; газавыя — Гронінген, Троль, Леман, Фрыг. У структуры басейна вылучаюць 3 буйныя элементы — Паўночнаморскую і Балт. сінеклізы і Люблінска-Львоўскую ўпадзіну. Нафтагазаносныя тэрыгенныя і карбанатныя адклады сярэдняга кембрыю, дэвону, карбону, пярмі, юры, мелу і палеагену. Глыб. залягання прадуктыўных гарызонтаў 200 — 4000 м. Шчыльн. нафты 800—987 кг/м^3. Газы разнастайныя паводле саставу. Гал. цэнтры здабычы Экафіск (Нарвегія), Слохтэрэн (Нідэрланды) і інш.

ЦЭНТРАЛЬНАІНДЫ́ЙСКІ ХРЫБЕ́Т, частка падводнага сярэдзіннаакіянічнага хрыбта Індыйскага ак., паміж паўд. тропікам і а-вамі Амстэрдам і Сен-Поль. Даўж. 2300 км, шыр. да 500 м. Найменшая глыбіня над грэбенем 1145 м. Плато Амстэрдам на паўд.-ўсх. канцы хрыбта ўяўляе сабой падняцце з адноснай выш. каля 1500 м, асобныя вяршыні якога ўтвараюць вулканічныя а-вы Амстэрдам і Сен-Поль. У паніжэннях рэльефу форамініферавыя ілы, на стромкіх схілах выхады базальтаў.

ЦЭНТРАЛЬНАКАЗАХСТА́НСКІ ДРАБНАСО́ПАЧНІК, горная краіна ў цэнтр. і ўсх. ч. Казахстана; тое, што *Казахскі драбнасопачнік*.

ЦЭНТРАЛЬНАЛЯСНЫ́ ЗАПАВЕ́ДНІК біясферны. У Цвярской вобл. (Расія), на ПдЗ *Валдайскага ўзвышша*, на водападзеле рэк Волга і Зах. Дзвіна. Засн. ў 1931 для захавання і вывучэння прыроднага комплексу яловых лясоў і вярховых сфагнавых балот лясной зоны. Пл. 42,3 тыс. га. Рэльеф слабаўзгорысты. Глебы падзолістыя, слабападзолістыя, балотныя. Пераважаюць яловыя і ялова-шыракалістыя лясы. У рачных поймах насаджэнні чорнай вольхі. Сфагнавыя балоты займаюць 18% тэр. У флоры 546 відаў раслін, у Чырв. кнізе чаравічак сапраўдны і луннік ажываючы. У Ц.з. праходзіць паўд. мяжа арэала бярозы карлікавай. У фауне — буры мядзведзь, воўк, рысь, лось, казуля, дзік, бабёр, куніца, выдра, норка еўрапейская, ласка, ліс, палятуха і інш.; 195 відаў птушак, у Чырв. кнізе беркут, чорны бусел.

ЦЭНТРАЛЬНАЧАРНАЗЁМНЫ ЗАПАВЕ́ДНІК імя В.В.Алёхіна, біясферны. У Курскай і Белгародскай абл., Расія. Засн. ў 1935 для аховы і вывучэння унікальных прыродных комплексаў лесастэпу. Пл. 5,3 тыс. га. Складаецца з 6 асобных участкаў. Рэльеф эразійны. Глебы — моцныя тыповыя чарназёмы, якія ніколі не ўзворваліся, маюць гумусу да 9—12%, таўшчыня гумусавага слоя да 1 м. У расл. покрыве спалучэнне лугавога стэпу і дуброў. У флоры больш за 900 відаў вышэйшых сасудзістых раслін, з іх 86 рэдкіх. У фауне 38 відаў млекакормячых (барсук, ліс, тушканчык вялікі, суслік рабы, мышоўка стэпавая, заяц-русак і інш.), 184 птушак (каршун чорны, сарыч, канюк касматаногі, зязюля, дзяцел вялікі стракаты і інш.), 6 рэптылій, у т.л. гадзюка стэпавая, 7 земнаводных, больш за 4 тыс. насякомых.

ЦЭНТРА́ЛЬНАЯ А́ЗІЯ, прыродная краіна, якая ахоплівае ўнутрымацерыковую Азію, у межах Кітая і Манголіі. Пл. каля 6 млн. км^2. Пласкагор'і і раўніны ўтвараюць 2 асн. ярусы: ніжні паўн. вышынёй 500—1500 м (*Гобі, Алашань, Ордас, Джунгарская раўніна* і *Кашгарская раўніна*) і верхні паўд. вышынёй 4000—4500 м (*Тыбецкае нагор'е*). Яны раздзелены ці акаймаваны высокімі хрыбтамі Цянь-Шаня, Куньлуня, Наньшаня, Каракарума, Гандысышаня і інш. вышынёй больш за 5000 м (найб. выш. 8611 м, г. Чагары ў Каракаруме).

Клімат рэзка кантынент., сухі. Ападкаў на раўнінах 50—200 мм, у гарах да 500—1000 мм за год. Сярэднія т-ры студз. ад -10 °С да -25 °С, ліп. 20—25 °С, на Тыбецкім нагор'і каля 10 °С. Пл. зледзянення 50—60 тыс. км^2. Снегавая мяжа на выш. ад 3500 м на Пн да 6000 м на Пд. Большая ч. тэр. — вобласць унутр. сцёку. Сцёк у акіян маюць толькі ўскраінныя вобласці, дзе бяруць пачатак вял. рэкі Азіі (Янцзы, Хуанхэ, Меконг, Брахмапутра, Інд, Іртыш, Амур і інш.). Шмат азёр, пераважна на Пн МНР і на Тыбецкім нагор'і (Кукунор, Хубсугул, Намца і інш.). Пераважае разрэджаная паўпустынная і пустынная куцікавая расліннасць, на Пн — стэпавая. У гарах участкі лясоў і лугоў, на Тыбецкім нагор'і — ландшафты халодных пустынь на вечнамярзлотных грунтах. Па далінах рэк — тугайныя лясы. Значную тэр. займаюць саланчакі, такыры, камяністыя паверхні, пяскі, а таксама ландшафты нівальнага пояса, дзе расл. покрыва амаль адсутнічае. Аазіснае земляробства, качавая жывёлагадоўля. З 1993 пасля адмаўлення ад назвы *Сярэдняя Азія* тэр. краін СНД, што ўваходзілі ў яе (Казахстан, Кыргызстан, Таджыкістан, Туркменістан, Узбекістан) уваходзяць у Ц.А. *М.В.Лаўрыновіч.*

ЦЭНТРА́ЛЬНАЯ АМЕ́РЫКА, паўднёвая ч. мацерыка *Паўночная Амерыка*. Размешчана паміж тэктанічнай упадзінай Бальсас (каля паўд. ускраіны Мекс. нагор'я, 18 ° паўн. ш.) на Пн і Дар'енскім перашыйкам (8—9 ° паўн. ш.) на Пд. Часам паўн. і паўд. межы праводзяць адпаведна па Тэўантэпекскім і Панамскім перашыйках. На тэр. Ц.А. размешчаны краіны: Беліз, Гватэмала, Гандурас, Коста-Рыка, Нікарагуа, Панама, Сальвадор, Мексіка (паўд.-ўсх. ч.). Шырыня тэр. Ц.А. ад 960 км у раёне п-ва Юкатан да 48 км на Панамскім перашыйку.

У рэльефе на эпігерцынскай платформе п-ва Юкатан, укрытай чахлом з кайназойскіх вапнякоў, пераважаюць нізіны з шырокім развіццём карсту. У горным поясе Кардыльераў у зах. ч. пераважаюць раннепалеагенавыя геаантыклінальныя структуры з метамарфічных і інтрузійных палеазойскіх парод, моцна расчлянёныя разломамі і эрозіяй. У цэнтр. ч. Ц.А. вулканічныя нагор'і са шматлікімі конусамі актыўных вулканаў (Тахумулька, 4217 м — найвыш. пункт Ц.А.). Вял. колькасць тэктанічных дэпрэсій (найб. ўпадзіна Нікарагуа). Усх. частка Ц.А. складзена з кайназойскіх вулканічных і асадкавых парод; ланцугі вулканічных конусаў (Вулканічная Сьера). Уздоўж узбярэжжаў акіянаў нізіны і раўніны, якія працягваюцца вузкай паласой каля Ціхага ак. і шырокай — каля мораў Атлантычнага ак. (найб. — Маскітавы бераг). Карысныя выкапні: руды золата, серабра, свінцу, сурмы, паклады нафты, серы.

Клімат трапічны і субэкватарыяльны. Сярэднія гадавыя т-ры ад 21 °С на Пн да 28 °С на Пд. Ападкаў на наветраных схілах гор 4000—7000 мм за год; на ціхаакіянскім узбярэжжы на Пн да 1000 мм за год (6—7 мес засуха), на Пд — 1700 мм (3 мес засуха). На Юкатане ападкаў да 5000 мм за год. Рэкі кароткія, з малой плошчай басейнаў. Гушчыня сеткі і стромае падзенне рэк забяспечвае высокі гідраэнергетычны патэнцыял і значныя водныя рэсурсы для арашальных зямель. На ПнУ вільготныя трапічныя лясы (пальмы, дрэвы з каштоўнай драўнінай, каўчуканосы, ліяны, эпіфіты і інш.), плантацыі бананаў, цукр. трыснягу, какавы і інш. На засушлівых ціхаакіянскіх схілах лістападныя рэдкалессі (акацыі, мімозы). На ПдЗ і Пн — лістападныя лясы і хмызняковыя зараснікі, у гарах вышынная пояснасць ландшафтаў. На пласкагор'ях пашы і пасевы бабовых, бульбы, кукурузы. Водзяцца малпы, ягуары, браняносцы, мураўеды, тапіры, лятучыя мышы. Трапляюцца прадстаўнікі жывёльнага свету Паўн. Амерыкі: рысі, яноты, грызуны, птушкі. *М.В.Лаўрыновіч.*

ЦЭНТРА́ЛЬНАЯ А́ФРЫКА, Экватарыяльная Афрыка, прыродная вобласць у Афрыцы, у прыэкватарыяльнай зоне паміж 7—8 ° паўн. ш. і 12—30 ° паўд. ш. Ахоплівае пераважна тэр. *Конга ўпадзіны* і пласкагор'яў, што яе акаймоўваюць; на З прылягае да Атлантычнага ак. і Гвінейскага зал., на У мяжуе з Усх.-Афрыканскім пласкагор'ем. На тэр. Ц.А. поўнасцю ці часткова знаходзяцца дзяржавы: Ангола, Габон, Дэмакр. Рэспубліка Конга, Замбія, Камерун, Конга, Цэнтральнаафр. Рэспубліка, Экватарыяльная Гвінея; у яе склад уключаюць таксама астраўную дзяржаву Сан-Таме і Прынсіпі. Выш. 300—500 м у цэнтр. ч. ўпадзіны, 500—1000 м на Пн і З, 1000—1500 м і больш на ПдУ.

Рэльеф некаторых ускраінных зон моцна расчлянёны, закрануты маладымі глыбавымі рухамі (узбярэжжа Гвінейскага зал., дзе на лініі тэктанічнага разлому знаходзіцца найвыш. яе пункт — вулкан Камерун (4070 м). Клімат пераважна экватарыяльны, пастаянна вільготны (ападкаў больш за 1500 мм за год, на зах. схілах Камеруна да 10000 мм); на Пн і Пд — субэкватарыяльны, летневільготны (ападкаў 600—1000 мм за год); на значнай ч. ўзбярэжжа Атлантычнага ак. — трапічны пасатны (ападкаў 200—300 мм за год). Сярэднегадавыя т-ры 25—28 °С. Густая і мнагаводная рачная сетка ў бас. р. Конга (Заір). Рэкі маюць шмат парогаў, вадаспадаў, вял. запасы гідраэнергіі. Азёр мала. Вял. плошчы заняты балотамі. Каля экватара вечназялёныя лясы (гілеі) на чырв.-жоўтых латэрытных глебах; на Пн і Пд змяняюцца лістападнымі вечназялёнымі лясамі і высакатраўнымі саваннамі на чырв. глебах. Па далінах рэк галерэйныя лясы, у вусцях мангравыя зараснікі. Водзяцца малпы, у т.л. шымпанзэ і гарыла, паўмалпы галага, кутасавухія свінні, калючкахвосты, віверы, лятучыя мышы; вял. разнастайнасць птушак, рэптылій, насякомых.

М.В.Лаўрыновіч.

ЦЭНТРА́ЛЬНАЯ БЕЛАРУ́СКАЯ ВАЙСКО́ВАЯ РА́ДА (ЦБВР), арганізацыя, якая ў 1917—18 займалася фарміраваннем бел. войска і каардынавала працу бел. вайсковых рад. Створана на з'ездзе беларусаў-вайскоўцаў Зах. фронту, 12-й арміі Паўн. фронту і Балт. флоту ў Мінску (13—19.11.1917), дзе быў абраны Часовы выканаўчы к-т ЦБВР на чале з С.А.Рак-Міхайлоўскім. ЦБВР стварыла спец. аддзел па фарміраванні бел. вайск. адзінак, які ўзначаліў ген.-лейт. К.А.Кандратовіч, і адправіла на франты вярбоўшчыкаў. Пасля з'ездаў беларусаў-вайскоўцаў Паўн., Рум. і Паўд.-Зах. франтоў (усе ў ліст. 1917—студз. 1918) іх прадстаўнікі папоўнілі склад Выканкома рады. Друкаваны орган — газ. *«Белорусская рада»*. Намаганнямі ЦБВР у ліст. 1917 створаны бел. полк у Мінску і конны эскадрон пад Оршай. ЦБВР атрымала ад Вярх. галоўнакамандуючага М.В.Крыленкі ў выніку перагавораў 10—11.1.1918 дазвол на стварэнне бел. нац. Чырв. гвардыі і прызначыла пунктамі яе фарміравання Мінск, Бабруйск, Рагачоў, Магілёў і Барысаў. Аднак з-за пазіцыі прадстаўнікоў Аблвыкамзаха, якія сарвалі праезд спец. створанай для гэтага камісіі, ЦБВР не здолела ажыццявіць намечаны план. Члены ЦБВР удзельнічалі ў арганізацыі і правядзенні *Усебеларускага з'езда 1917*, стварэнні *Беларускай Народнай Рэспублікі*.

Літ.: Савіцкі В. Беларускае войска: ад ідэі да спроб рэалізацыі (1917 г.) // Бел. гіст. часоп. 1994. № 4.

В.Г.Мазец.

ЦЭНТРА́ЛЬНАЯ БЕЛАРУ́СКАЯ РА́ДА ВІ́ЛЕНШЧЫНЫ І ГРО́ДЗЕНШЧЫНЫ, орган паліт. прадстаўніцтва бел. нац. руху ў зах. частцы Беларусі ў час польск. акупацыі 1919—21. Утворана 9—10.6.1919 на Бел. з'ездзе Віленшчыны і Гродзеншчыны. У 1-ы склад прэзідыума ўвайшлі: К.Душэўскі (старшыня), М.Кахановіч (віцэ-старшыня), Я.Станкевіч, Б.Тарашкевіч, Я.Чарапук, святар Кушнеў, ксёндз М.Пятроўскі і інш. Выступала ў абарону сац. і нац. правоў бел. народа, спрыяла развіццю бел. школы, выдавецкай справы, кааперацыі, займалася дабрачыннасцю на карысць пацярпелых ад вайны і дзяцей-сірот. Знаходзілася пад уплывам партыі бел. эсэраў. У паліт. дзейнасці прытрымлівалася актаў БНР за незалежную і дэмакр. бел. рэспубліку. У 1919, калі Рада БНР фактычна не функцыянавала, прэтэндавала на ролю гал. паліт. цэнтра бел. вызв. руху. 2.8.1919 ініцыіравала стварэнне Бел. вайск. арг-цыі (пазней пераўтворана ў *Беларускую вайсковую камісію*), 15.7.1919 — выдавецкага т-ва «Веда», 22.9.1919 — бел. настаўніцкіх курсаў у Вільні. З 18.9.1919 выдавала інфарм. бюлетэнь рады лацінкай і кірыліцай (выйшла больш за 10 нумароў). У вер. 1919 у склад Рады кааптаваны прадстаўнікі ад Бел. настаўніцкага саюза ў Вільні, Бел. т-ва дапамогі ахвярам вайны, Віленскага Белнацкома, Віленскага саюза кааперацыі і інш. арг-цый: І.Канчэўскі, А.Карабач, Ф.Кушаль, В.Ластоўскі, Ф.Ярэміч і інш. 18.9.1919 у новы склад прэзідыума ўвайшлі Тарашкевіч (старшыня), Кахановіч, Карабач (віцэ-старшыні), Ластоўскі (сакратар), Ярэміч (скарбнік). На працягу сваёй дзейнасці Рада неаднаразова выступала з пратэстамі супраць рэпрэсій і рэквізіцый бел. жыхароў, арыштаў бел. нац. дзеячаў, закрыцця бел. навуч. устаноў з боку польск. акупац. улад. У пач. 1920-х г. з-за адсутнасці Тарашкевіча абавязкі старшыні выконваў Карабач. У гэты час у сувязі з моцным паліт. і адм. уціскам польскіх улад рада фактычна спыніла сваю дзейнасць. Спробы актывізаваць яе працу ў канцы 1920 — пач. 1921 поспеху не мелі.

У.В.Ляхоўскі.

ЦЭНТРА́ЛЬНАЯ БЕЛАРУ́СКАЯ ШКО́ЛЬНАЯ РА́ДА (ЦБШР), бел. культурна-асветная арг-цыя ў 1919—20. Засн. ва ўмовах польскай акупацыі на базе *Беларускай школьнай рады Меншчыны*, а таксама рад Віленшчыны і Гродзеншчыны. Старшыня С.Рак-Міхайлоўскі, нам. В.Іваноўскі, А.Смоліч, чл. прэзідыума Л.Дзекуць-Малей, Я.Станкевіч (кіраўнік школьнага выд-ва), сакратар У.Чайка. Арганізоўвала бел. навуч. ўстановы і кіравала імі, стварала мясц. бел. школьныя рады, культ.-асв. гурткі і б-кі, выдавала падручнікі і навуч. дапаможнікі, распаўсюджвала бел. газеты і часопісы.

«ЦЭНТРА́ЛЬНАЯ ГАЗЕ́ТА», грамадска-палітычная газета. Заснавальнікі — *Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці* і *Беларускае таварыства інвалідаў па зроку*. Выдавалася з 6.5.1994 да 28.6.2002 у Мінску на бел. і рус. мовах раз у тыдзень. Асвятляла дзейнасць органаў заканад. і выканаўчай улады Рэспублікі Беларусь, адстойвала прынцыпы сац. справядлівасці, садружнасці слав. народаў (мела старонку «Славянскі цэнтр»), палемізавала з інш. выданнямі па пытаннях грамадска-паліт., эканам., міжнар. жыцця, расказвала аб праблемах і шляхах развіцця навукі, культуры і сельскай гаспадаркі. Публікавала аналіт. матэрыялы па праблемах экалогіі, маралі і права, рэпартажы, нарысы пра найб. значныя сац., культ. і спарт. падзеі, новыя творы бел. пісьменнікаў і інш. Мела рубрыкі: «Адзінства», «Пункт гледжання», «Фрагменты геапалітыкі», «Праўда ў вочы», «Духоўнасць», «Сыны Айчыны», «Трыбуна паэта», «Векапомнае» і інш. З газетай супрацоўнічалі бел. вучоныя, грамадскія дзеячы, творчая інтэлігенцыя і інш.

Т.У.Люковіч.

ЦЭНТРА́ЛЬНАЯ ДЭПУТА́ЦЫЯ ВЯЛІ́КАГА КНЯ́СТВА ЛІТО́ЎСКАГА, паўстанцкі ўрадавы выканаўчы орган у Літве і зах. Беларусі ў час *паўстання 1794*. У выніку абвастрэння адносін паміж кіраўнікамі паўстання ў Польшчы і ВКЛ у маі 1794 Т.*Касцюшка* пад націскам кансерватыўных сіл 4 чэрв. адхіліў ад улады кіраўніка паўстання ў Літве і Беларусі Я.*Ясінскага* як радыкала ў паліт. поглядах і мясц. сепаратыста. Галоўнакамандуючым літоўска-бел. паўстанцкай арміяй прызначаны няздольны ген.-лейтэнант М.Вяльгорскі. Загадам Касцюшкі ад 10 чэрв. *Найвышэйшая літоўская рада* распушчана, а замест яе ўтворана Ц.д. ВКЛ з больш памяркоўных дзеячаў. Кіраўніцтва паўстаннем у Літве і Беларусі *Найвышэйшая нацыянальная рада* ў Варшаве ўзяла пад свой кантроль. У склад дэпутацыі ўваходзілі 7 дэпутатаў, якія кіравалі аддзеламі і па чарзе ўзначальвалі дэпутацыю, і 28 іх намеснікаў. Дэпутацыя была абмежавана ў сваёй дзейнасці. Яна лічылася паўнамоцным прадстаўніцтвам Найвышэйшай нац. рады ў Варшаве і была цалкам падпарадкавана Касцюшку. Дэпутаты былі прызначаны ў Варшаве Найвышэйшай нац. радай, а намеснікі — самой дэпутацыяй. У дэпутацыю ўваходзілі: Ю.Несялоўскі (аддзел скарбу), А.Тызенгаўз (прэзідэнт Вільні, аддзел парадку), В.Гарэцкі (аддзел бяспекі), С.Мірскі (аддзел юстыцыі), Б.Марыконі (аддзел харчавання), Д.Пільхоўскі (аддзел адукацыі). Дэпутацыя размяшчалася ў Вільні і дзейнічала на тэрыторыі, занятай паўстанцамі. Напярэдадні заняцця Вільні рас. войскамі (пач. жн. 1794) дэпутацыя падзялілася на 2 часткі: Марыконі, Мірскі і інш. выехалі ў Гродна, другая частка — у Коўна. Там яны працягвалі ўрадавую дзейнасць. У пач. вер. 1794 дзеячы дэпутацыі сабраліся ў Гродне, але ў пач. кастр. пакінулі горад разам з войскамі, што адступілі ў Польшчу.

А.П.Грыцкевіч.

ЦЭНТРА́ЛЬНАЯ КАТЛАВІ́НА, 1) падводная катлавіна ў цэнтр. ч. Ціхага ак., паміж а-вамі Маршалавымі, Тувалу і Гілберта на З і падводным хр. Лайн на У. Даўж. каля 4,4 тыс. км, шыр. каля 2,5 тыс. км; пераважаюць глыбіні 5000—

5500 м, найб. — 6957 м. Над дном узвышаюцца асобныя падводныя горы (Віцязя, Цітова), хрыбты, якія ўтвараюць а-вы Фенікс і Такелау, у паўн. ч. — вял. ўзвышша Магелана. Асадкі — пераважна чырв. гліна і радыялярыевая ілы. 2) Падводная катлавіна ў Індыйскім ак., паміж мацерыковым схілам Азіі, падводнымі Цэнтральнаінд. і Усх.-Інд. хрыбтамі. Даўж. каля 6 тыс. км, шыр. каля 1,6 тыс. км. Пераважаюць глыб. больш за 5000 м, найб. — 6090 м. У цэнтр. ч. — мерыдыянальны падводны хр. Ланка і падводная г. Афанасія Нікіціна з мінімальнай глыб. над ёй 1549 м.

ЦЭНТРА́ЛЬНАЯ МЕ́СА (Mesa Central), горная вобласць на Пд *Мексіканскага нагор'я*, у Мексіцы. Пераважныя выш. 2000—3000 м. Спадзістыя базальтавыя плато, азёрныя катлавіны спалучаюцца з ізаляванымі гарамі і вулканічнымі масівамі. Найб. магутныя вулканы, у т.л. дзеючыя, у горным ланцугу Папярочнай Вулканічнай Сьеры (*Арысаба* — 5700 м, Каліма, *Папакатэпетль* і інш.).

Клімат горны трапічны. Сярэднія месячныя т-ры 10—17 °С. Ападкаў ад 250 на ПнЗ да 500—900 мм за год на ПдУ, месцамі да 1500 мм. Глебы шэра-карычневыя. У расл. покрыве пераважаюць антрапагенныя саванны. Лясы б.ч. высечаны. На схілах гор разрэджаныя дубова-хваёвыя лясы; на вільготных участках — вечназялёныя (дуб, мірт, магнолія, дрэвападобная папараць). Верхні пояс утвараюць хваёва-піхтавыя лясы, якія змяняюцца субальпійскімі і альпійскімі лугамі. Ц.М. густа населена. Развіта сельская гаспадарка (збожжавыя, плантацыі агаў). *М.В.Лаўрыновіч.*

ЦЭНТРА́ЛЬНАЯ НЕРВО́ВАЯ СІСТЭ́МА, асноўны аддзел *нервовай сістэмы* жывёл і чалавека, гал. і спецыфічная функцыян. дзейнасць якога — ажыццяўленне *рэфлексаў*, звязаных з распаўсюджваннем *узбуджэння* і *тармажэння* па *рэфлекторных дугах*. У беспазваночных складаецца з *гангліяў* і нерв. ланцужка, у пазваночных — са *спіннога мозга* і *галаўнога мозга*. У вышэйшых жывёл і чалавека ніжэйшыя і сярэднія аддзелы Ц.н.с. — спінны мозг, прадаўгаваты мозг, *сярэдні мозг, прамежкавы мозг, мазжачок* — рэгулююць дзейнасць асобных органаў і сістэм арганізма, ажыццяўляюць сувязь і ўзаемадзеянне паміж імі, забяспечваюць адзінства арганізма і цэласнасць яго дзейнасці. Спецыфічная аднаква Ц.н.с. — забеспячэнне функцыян. субардынацыі (пэўнай супадпарадкаванасці паміж органамі). Вышэйшы аддзел Ц.н.с. — *кара вялікіх паўшар'яў* галаўнога мозга.

У прасцейшых жывёл адсутнічае. У кішачнаполасцевых дыфузная нерв. сістэма. Станаўленне прасцейшай Ц.н.с. звязана з сегментацыяй цела (напр., у расчных чарвей фарміруюцца нерв. вузлы). У пазваночных Ц.н.с. ўтвараецца ў эмбрыягенезе з вонкавага зародкавага лістка (эктадэрмы) і адносіцца да тыпу трубчастай нерв. сістэмы. У працэсе *нейруляцыі* пярэдні канец нерв. трубкі падзяляецца на 3 *мазгавыя пузыры*, яе задняя частка ператвараецца ў спінны мозг. У працэсе гіст. развіцця пазваночных яе будова ўскладнялася, часткі, размешчаныя ў пярэднім аддзеле цела (галаўны мозг, асабліва кара вялікіх паўшар'яў), набылі надзвычай важнае значэнне (гл. *Вышэйшая нервовая дзейнасць*). Імпульсы ад *рэцэптараў* праходзяць па *цэнтраімклівых нервовых валокнах*, далей яны перадаюцца на *цэнтрабежныя нервовыя валокны*, па якіх узбуджэнне дасягае органаў і тканак, выклікаючы змены іх функцыян. стану.

Літ.: Костюк П.Г. Физиология центральной нервной системы. Киев, 1977; Общая физиология нервной системы. Л., 1979; Частная физиология нервной системы. Л., 1983. *Т.І.Жукоўская.*

ЦЭНТРА́ЛЬНАЯ РА́ДА Украіны, Украінская цэнтральная рада (УЦР), вышэйшы заканадаўчы і выканаўча-распарадчы орган улады на Украіне ў 1917—18. Створана 4(17).3.1917, неўзабаве пасля Лют. рэвалюцыі, як кіруючы орган аб'яднання ўкр. нац. партый сацыяліст. арыентацыі (Укр. партыя сацыялістаў-федэралістаў, Укр. с.-д. рабочая партыя, *Украінская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў* і інш.). Абапіраючыся на падкантрольныя ёй Саветы і ўкр. вайск. часці, да восені 1917 набыла рысы паралельнага органа ўлады. У маі—ліп. 1917 УЦР налічвала 815 членаў. Старшыня — М.С.*Грушэўскі*, які ўзначальваў і Малую Раду (30 чл.) — пастаянна дзеючы заканад. орган УЦР. Яе выканаўчы орган — Ген. сакратарыят (з ліст. 1917 пашыраны Ген. сакратарыят, у студз. 1918 рэарганізаваны ў Савет Міністраў); яго старшыня і ген. сакратар (міністр) унутр. спраў — У.К.*Віннічэнка* (са студз. 1918 старшыня СМ У.А.Галубовіч), ген. сакратар (міністр) па ваен. справах — С.В.*Пятлюра*. УЦР варожа ставілася да Кастр. рэвалюцыі 1917. З дапамогай сваіх войск 31.10(13.11). 1917 захапіла ўладу ў Кіеве. У сваім 3-м універсале 7(20).11.1917 абвясціла *Украінскую Народную Рэспубліку* (УНР), а сябе — яе вышэйшым органам. У 4-м універсале 9(22).1.1918 абвясціла поўную незалежнасць УНР. УЦР ад імя УНР удзельнічала ў перагаворах аб міры з краінамі аўстра-герм. блоку (гл. *Брэсцкі мір 1918*), якія 30.12.1917 (12.1.1918) прызналі яе дэлегацыю самастойнай, а 19.1.(1.2).1918 і незалежнасць УНР; 27.1(9.2).1918 падпісалі з ёй сепаратны дагавор аб міры і саюзе. УЦР папрасіла ваен. дапамогу супраць сав. Расіі і разам з аўстра-герм. войскамі 1.3.1918 вярнулася ў Кіеў, які 26.1(8.2).1918 пакінула пад націскам сав. войск. Ва ўмовах аўстра-герм. акупацыі Украіны УЦР не здолела забяспечыць вываз харчавання ў Германію і падавіць вызв. рух. У выніку паміж ёй і герм. камандаваннем узніклі супярэчнасці. 29.4.1918 ген. П.П.*Скарападскі* пры падтрымцы герм. войск разагнаў УЦР і ўстанавіў дыктатарскі рэжым — *гетманшчыну*.

Кр.: Українська Центральна Рада: Док. і матеріали. Т. 1—2. Київ, 1996—97.

Літ.: Мироненко О.М. Світоч української державності: Політико-правовий аналіз діяльності Центральної Ради. Київ, 1992; Діячі Української Центральної Ради: Біогр. довід. Київ, 1998.

ЦЭНТРА́ЛЬНАЯ РА́ДА БЕЛАРУ́СКІХ АРГАНІЗА́ЦЫЙ, каардынацыйны орган бел. нац. партый і грамадскіх арг-цый у ліп.— кастр. 1917. Створана на *з'ездзе беларускіх нацыянальных арганізацый і партый* 8—10(21—23).7.1917 на аснове б. мінскага *Беларускага нацыянальнага камітэта*. У яго выканаўчы к-т абраны правадз. члены У.Галубок, Я.Лёсік, А.Лявіцкі (Ядвігін Ш.), А.Смоліч (фактычны кіраўнік), У.Фальскі і кандыдаты В.Лявіцкая, Турчыновіч, Парэчын. Зацверджаны паліт. ўпаўнаважаныя рады ў Петраградзе (Ф.Ярэміч, П.Бадунова, К.Дуж-Душэўскі), Маскве (Я.Васілевіч, Я.Дыла), для сувязі з Усерас. сял. саюзам (А.Бурбіс, З.Жылуновіч). На 1-й сесіі рады (5—6.8.1917) прыняты статут арг-цыі, паводле якога рада складалася з дэпутатаў ад усіх бел. арг-цый, валасных, гар. і пав. органаў самакіравання, к-таў бежанцаў і гурткоў беларусаў-вайскоўцаў. Сваю дзейнасць рада будавала на 2 гал. прынцыпах: «палітычны — поўны дэмакратызм і сацыяльны — перадача зямлі без выкупу працоўнаму народу і абарона інтарэсаў работнікаў», чым падкрэслівалася дамінуючая роля прадстаўнікоў БСГ у радзе. Сесія абрала новы склад выканаўчага к-та: Лёсік, Дыла, Р.Астроўскі, П.Галавач, Ф.Шантыр, Смоліч, С.А.Курчановіч-Сяўрук (сакратар), Бадунова, Жылуновіч, Каткоўская (кандыдат). Дзейнасць рады адыграла станоўчую ролю ў аб'яднанні бел. нац. арг-цый, пашырэнні ідэй адраджэння бел. культуры. У кастр. 1917 рэарганізавана ў *Вялікую беларускую раду*.

Літ.: Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. Ч. 1—3. Гомель, 1993.

У.В.Ляхоўскі.

ЦЭНТРА́ЛЬНАЯ СІ́ЛА, прыкладзеная да цела сіла, лінія дзеяння якой праходзіць праз пэўны пункт (цэнтр сілы) пры любых становішчах гэтага цела. Напр., *сіла цяжару*, сіла эл.-статычнага ўзаемадзеяння кропкавых эл. зарадаў (гл. *Кулона закон*). Рух свабоднага *матэрыяльнага пункта* адбываецца па плоскай траекторыі, а адрэзак прамой, які злучае гэты пункт з цэнтрам сілы, апісвае за роўныя прамежкі часу роўныя плошчы (гл. *Кеплера законы*). Тэорыя руху цел пад уздзеяннем Ц.с. мае дастасаванні ў нябеснай механіцы, пры разліках руху касм. лятальных апаратаў, у т.л. ШСЗ, і інш.

ЦЭНТРАЛЬНАЯКУ́ЦКАЯ НІЗІ́НА, Цэнтральнаякуцкая раўніна, Вілюйская нізіна. Ва Усх. Сібіры, у міжрэччы р. Лена і Вілюй, у Якуціі. Выш. ад 60 да 400 м. Плоская, моцна забалочаная раўніна, расчлянёная сеткай рачных далін. Радовішчы кам. вугалю, жал. і поліметал. руд, газу, золата, алмазаў, слюды. Паўсюдна пашырана шматгадовая мерзлата.

Тэрмакарставыя азёры, аласы, булгуняхі. Клімат рэзка кантынентальны, суровы. Б.ч. нізіны ўкрыта пераважна лістоўнічнымі і лістоўнічна-хваёвымі лясамі з участкамі бярозавых лясоў і лугавых стэпаў.

ЦЭНТРА́ЛЬНЫ АРХІ́Ў МІНІСТЭ́РСТВА АБАРО́НЫ (ЦАМА) Рэспублікі Беларусь, Архіў Міністэрства абароны. Створаны 16.6.1946 у Мінску на базе аддзела архіваў штаба БВА. Спачатку наз. Архіў штаба БВА (у 1951—56 часова — «аддзел архіваў»), дзе камплектаваліся дакументы вайск. часцей і ўстаноў, што дыслацыраваліся на тэр. БВА, упраўленняў і аддзелаў яго штаба. Кожныя 5 гадоў адбывалася перадача дакументаў у Цэнтр. архіў Мін-ва абароны СССР (апошні раз перададзены дакументы да 1980). 4.1.1993 пераўтвораны ў ЦАМА. На 1.1.2003 у архіве 525 743 адзінкі архіўнага захавання, у т.л. 308 604 справы і 217 139 асабістых картак уліку рабочых і служачых Узбр. сіл; 4676 фондаў. Справы размешчаны ў 2 сховішчах: у 1-м дакументы БВА, у 2-м — ваен. структур, што сфарміраваліся пасля 1991. Існуюць аддзелы: архіваў, уліку, захавання і інфарм.-пошукавых сістэм; інфарм.-даведачнай працы. Найб. значныя фонды: структур штаба БВА і яго падведамстваў, ваен. ВНУ, мед. устаноў, фін. органаў, парт. і камсамольскіх арг-цый, ліквідацыйныя акты і інш. Значная колькасць дакументаў па асабовым складзе перададзена ў архіў у 2-й пал. 1990-х г. з ваен. камісарыятаў. Захоўваюцца картатэкі паслужных картак з інфармацыяй пра ўсіх афіцэраў, што служылі ў БВА, пра ваеннаслужачых, якія ўдзельнічалі ў ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, і інш. Дакументы архіва выкарыстоўваюцца для адказаў на запыты сац.-прававога характару, для даследавання гісторыі вайск. часцей і злучэнняў; а таксама складальнікамі гісторыка-дакументальных хронік «Памяць» і інш.

Літ.: Жумарь С. Архив Министерства обороны Республики Беларусь // Архівы і справаводства. 2002. № 3. *У.Р.Заварошкін.*

ЦЭНТРА́ЛЬНЫ АРХІ́Ў МІНІСТЭ́РСТВА АБАРО́НЫ РАСІ́ЙСКАЙ ФЕДЭРА́ЦЫІ (ЦАМА РФ) у г. Падольск, установа Мін-ва абароны Рас. Федэрацыі, якая ажыццяўляе прыём, захаванне і навук.-тэхн. апрацоўку дакументальных матэрыялаў Сав. і Рас. армій з 1941. Створаны ў 1936 у Маскве як Аддзел архіваў пры Упраўленні справамі Наркама абароны СССР (у 1946 перавезены ў г. Падольск Маскоўскай вобл., у 1992 створаны філіял у г. Пугачоў Саратаўскай вобл.); з 1947 Архіў Мін-ва абароны ўзбр. сіл СССР, з 1975 Цэнтр. архіў Мін-ва абароны СССР, з ліп. 1992 сучасная назва. Каля 17,8 млн. адзінак захавання, каля 109 тыс. фондаў (2000). Захоўвае дакументы Сав. Арміі і ўстаноў Мін-ва абароны СССР — Рас. Федэрацыі з пач. Вял. Айч. вайны, у т.л. дакументы часцей і злучэнняў, што прымалі ўдзел у баявых дзеяннях і дыслацыраваліся на тэр. Беларусі ў 1941—91. Пры архіве дзейнічаюць экспертна-праверачная і метадычная камісіі. Архіў удзельнічае ў распрацоўцы пытанняў ваен. архіўнага справаводства і архіваграфіі.

ЦЭНТРА́ЛЬНЫ БАТАНІ́ЧНЫ САД Нацыянальнай АН Беларусі. Засн. ў 1932 у Мінску, з 1967 на правах НДІ. Пл. 144,7 га (з іх 90,9 га у Мінску). Калекцыйны фонд каля 10 тыс. відаў, форм, сартоў раслін: аранжарэйных, дрэвава-кустовых, кветкава-дэкар., лек., нетрадыц. кармавых і пладова-ягадных. Экспазіцыі: дэндрарый з батаніка-геагр. сектарамі Беларусі, Далёкаўсх. краю і Усх. Азіі, Паўн. Амерыкі, Еўропы і Сібіры, Каўказа, Крыма, Сярэдняй Азіі; кветкава-дэкар. раслін з самаст. садамі (ружоўнік, цюльпаннік, вяргіннік, бэзавы сад); ландшафтны парк; экалогіі раслін; біялогіі раслін; ахоўных раслін. Асн. кірункі даследаванняў: інтрадукцыя і акліматызацыя раслін; навук. асновы зялёнага буд-ва і аховы навакольнага асяроддзя; біяхімія і біятэхналогія раслін. Значны ўклад у развіццё навук. дзейнасці Ц.б.с. зрабілі С.П.*Мельнік*, М.Дз.*Несцяровіч*, М.У.*Смольскі*, У.М.*Рашэтнікаў*, Я.А.*Сідаровіч*, І.Н.*Рахцеенка*, М.А.*Кудзінаў* і інш.

Літ.: Итоги интродукции растений в Белорусской ССР (к 50-летию ЦБС АН БССР). Мн., 1982; Чаховский А.А., Шкутко Н.В. Декоративная дендрология Белоруссии. Мн., 1979; Ботанические сады: состояние и перспективы сохранения, изучения, использования биолог. разнообразия растительного мира. Мн., 2002. *У.М.Рашэтнікаў.*

ЦЭНТРА́ЛЬНЫ ВАЕ́ННА-МАРСКІ́ АРХІ́Ў (ЦВМА), навукова-даследчая ўстанова і сховішча дакументаў ВМФ Расіі з 1941. Засн. ў 1938. Знаходзіцца ў г. Гатчына Ленінградскай вобл. Працуе на правах аддзела Гал. штаба ВМФ і з'яўляецца гал. архівам у адносінах да інш. флатоў. У 5124 фондах ВМФ (1999) больш за 2,2 млн. архіўных спраў, якія шырока выкарыстоўваюцца ў навук. і практычных мэтах.

ЦЭНТРА́ЛЬНЫ ВАЕ́ННА-МАРСКІ́ МУЗЕ́Й у С.-Пецярбургу, культурна-асветная і н.-д. ўстанова ВМФ Расіі. Засн. ў 1709 як Мадэль-камера (сховішча для мадэляў караблёў), у 1805 пераўтворана ў Марскі музей. У яго фондах больш за 650 тыс. адзінак экзэмпляраў, у т.л. каля 2 тыс. мадэляў караблёў, 7 тыс. узораў зброі і баявой тэхнікі, каля 5 тыс. флагаў і сцягоў гераічных караблёў і злучэнняў, каля 1,5 тыс. твораў мастацтва. Філіялы музея: Кранштацкая крэпасць, крэйсер «Аўрора», «Дарога жыцця», «Чэсменская перамога».

ЦЭНТРА́ЛЬНЫ ВЫКАНА́ЎЧЫ КАМІТЭ́Т БССР (ЦВК БССР), вышэйшы заканадаўчы, распарадчы і кантрольны орган дзярж. улады БССР паміж Усебел. з'ездамі Саветаў у 1919—38. Выбіраўся на з'ездах Саветаў і быў падсправаздачны ім. Першы ЦВК БССР сфарміраваны на *Першым Усебеларускім з'ездзе Саветаў* у Мінску (2—3.2.1919).

1

2

3

Цэнтральны батанічны сад: 1 — галоўны ўваход; 2 — плантацыя цюльпанаў; 3 — алея з чаромхі Маака.

Усяго адбылося 11 скліканняў ЦВК БССР. ЦВК вызначаў агульны кірунак дзейнасці рабоча-сял. ўрада і ўсіх органаў сав. улады ў рэспубліцы, аб'ядноўваў і ўзгадняў работу па заканадаўстве і кіраванні, наглядаў за выкананнем Канстытуцыі, пастаноў з'ездаў Саветаў і цэнтр. органаў сав. улады, разглядаў і зацвярджаў праекты дэкрэтаў і інш. прапановы, што ўносіліся асобнымі ведамствамі, выдаваў дэкрэты і распараджэнні, склікаў з'езды Саветаў, уносіў частковыя змяненні ў Канстытуцыю з далейшым зацвярджэннем іх з'ездам Саветаў, утвараў цэнтр. органы дзярж. улады і кіравання, ажыццяўляў агульнае кіраўніцтва палітыкай і нар. гаспадаркай рэспублікі, устанаўліваў рэсп. бюджэт, заключаў дагаворы на знешнія і ўнутр. пазыкі, прымаў кодэксы законаў БССР, аб'яўляў агульную і прыватную амністыю, устанаўліваў адм.-тэр. падзел БССР, адмяняў пастановы акр. з'ездаў Саветаў і дзярж. органаў БССР, калі яны супярэчылі Канстытуцыі; меў права вырашаць любыя пытанні, што не адносіліся да кампетэнцыі Саюза ССР і выключнага вырашэння на Усебел. з'ездах Саветаў. ЦВК БССР фарміраваў урад рэспублікі — *Савет Народных Камісараў БССР* (СНК БССР). Паводле Канстытуцыі Сацыяліст. Сав. Рэспублікі Беларусь 1919 ЦВК выбіраў Вялікі і Малы Прэзідыумы ЦВК. Вялікі Прэзідыум выконваў функцыі ўрада, Малы Прэзідыум з'яўляўся агульным аператыўным выканаўчым органам для ЦВК і Вялікага Прэзідыума. З 1920 ЦВК БССР пачаў выбіраць адзіны Прэзідыум. У сувязі з вял. аб'ёмам работы ЦВК і Прэзідыум ЦВК стваралі дапаможныя органы: Сакратарыят Прэзідыума ЦВК і яго аддзелы, пастаянныя і часовыя камісіі ЦВК. Сесіі ЦВК БССР павінны былі склікацца Прэзідыумам ЦВК штомесячна, нечарговыя, або надзвычайныя, сесіі ЦВК — па ініцыятыве Прэзідыума ЦВК, прапанове СНК БССР або патрабаванні $^1/_3$ членаў ЦВК. Апошняя сесія ЦВК 11-га скліканння праведзена 13.11.1937. ЦВК апошняга 11-га склікання быў сфарміраваны *Адзінаццатым Усебеларускім з'ездам Саветаў* (14—22.1.1935) і дзейнічаў да выбрання Вярх. Савета БССР (гл. *Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь*).

Старшыні ЦВК БССР: А.Р.Чарвякоў (1920—37), М.В.Стакун (7.7—13.11.1937), Н.Я.Наталевіч (в.а., 14.11.1937—38).

Літ.: Широков А.Т. ЦИК Белорусской ССР в 1919—1936 гг. Мн., 1979; Круталевіч В.А., Юхо І.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917—1945 гг.). 2 выд. Мн., 2000. *І.Г.Яцкевіч.*

ЦЭНТРА́ЛЬНЫ КАМІТЭ́Т КПБ (ЦК КПБ), вышэйшы калектыўны кіруючы орган *Камуністычнай партыі Беларусі* паміж з'ездамі ў 1924—91. Выбіраўся з'ездам КПБ у складзе членаў і кандыдатаў у члены ЦК. У сваёй дзейнасці кіраваўся Праграмай і Статутам *Камуністычнай партыі Савецкага Саюза*, рашэннямі з'ездаў КПСС і КПБ, пленумаў ЦК КПСС. Да ўтварэння ЦК вышэйшымі кіруючымі органамі Кампартыі рэспублікі былі Цэнтр. бюро КП(б)Б, ЦК КП(б)ЛіБ, *Часовае Беларускае бюро ЦК РКП(б)*. ЦК КПБ узначальваў усю дзейнасць рэсп. парт. арг-цыі, арганізоўваў выкананне дырэктыў ЦК КПСС, кіраваў абл., гар., раённымі парт. арг-цыямі, ажыццяўляў падбор і расстаноўку кіруючых кадраў. ЦК КПБ фактычна кіраваў работай усіх органаў і грамадскіх арг-цый, вырашаў усе гал. пытанні дзярж. і грамадскага жыцця Беларусі. Праводзіў не менш як 1 пленарнае пасяджэнне ў 4 месяцы; паміж пленумамі дзейнічалі Бюро і Сакратарыят ЦК КПБ, якія выбіраліся ЦК КПБ. *М.Ф.Шумейка.*

ЦЭНТРА́ЛЬНЫ КАМІТЭ́Т КПЗБ (ЦК КПЗБ), вышэйшы кіруючы орган *Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі* (КПЗБ). Выбіраўся на з'ездах і канферэнцыях КПЗБ. Кіраваўся Праграмай і Статутам Кампартыі Польшчы (КПП), падпарадкоўваўся ЦК КПП. Паміж з'ездамі ажыццяўляў кіраўніцтва арганізац., агітац.-прапагандысцкай дзейнасцю партыі, яе акр. і раённых арг-цый. Друкаваныя органы — газеты і часопісы *«Чырвоны сцяг»*, *«Бальшавік»*, «Партыйнік», *«Бюлетэнь ЦК КПЗБ»*, *«Весткі з СССР»* і інш. Выходзячы з нелегальных умоў працы, складаўся фактычна з дзвюх частак — *Краявога сакратарыята ЦК КПЗБ* і *Бюро ЦК КПЗБ*. З 1923 нелегальна размяшчаўся ў Беластоку і Вільні. Пасля ўстанаўлення ў маі 1926 у Польшчы *«санацыйнага рэжыму»* Краявы сакратарыят ЦК КПЗБ размяшчаўся ў Варшаве, Бюро ЦК КПЗБ — у Гданьску, Берліне, Капенгагене (з 1933). Частка членаў ЦК КПЗБ знаходзіліся ў Мінску, ажыццяўлялі кіраўніцтва *Прадстаўніцтвам ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б*, замежнай часткай Цэнтр. рэдакцыі, *Мінскай школай КПЗБ*. Колькасны склад членаў ЦК КПЗБ: на I канферэнцыі КПЗБ (кастр. 1923) выбрана 4 чл. ЦК (у снежні іх колькасць павялічана да 7 чл.), на II канферэнцыі (ліст. 1924) — 8 чл. ЦК, на III канферэнцыі (студз. 1926) — 11 чл. і 5 канд. у чл. ЦК, на II з'ездзе КПЗБ (май 1935) — 11 чл. і 5 канд. у чл. ЦК. Сакратары ЦК КПЗБ: з 1923 — С.Т.Мілер, Л.Н.Аранштам, А.П.Данялюк; у 1925—36 — І.К.Лагіновіч. *У.Ф.Ладысеў.*

ЦЭНТРА́ЛЬНЫ КАМІТЭ́Т КСМЗБ (ЦК КСМЗБ), вышэйшы кіруючы орган *Камуністычнага саюза моладзі Заходняй Беларусі* паміж яго з'ездамі і канферэнцыямі. Створаны ў студз. 1924 на I канферэнцыі КСМЗБ (Вільня). Працаваў пад кіраўніцтвам ЦК КПЗБ і ЦК КСМ Польшчы. Складаўся з 5—9 членаў. Друкаваныя органы — газеты і часопісы *«Малады камуніст»*, *«Малады змагар»*, «Камсамолец», «Голас моладзі» і інш. Знаходзіўся на нелегальным становішчы ў Вільні, Беластоку, Варшаве. У розны час першымі сакратарамі ЦК КСМЗБ сталі І.Унгер, В.З.Харужая, А.А.Альшэўскі, Х.Р.Гелер, Ф.Шчапоўскі, М.С.Хазан, Д.Клемпнер, М.П.Маслоўскі, І.В.Малец, С.Р.Анісаў, М.М.Дворнікаў, А.І.Федасюк. *М.А.Бобер.*

ЦЭНТРА́ЛЬНЫ КАМІТЭ́Т ЛКСМБ (ЦК ЛКСМБ), вышэйшы кіруючы орган Ленінскага *Камуністычнага саюза моладзі Беларусі* паміж з'ездамі. Выбіраўся на з'ездзе ЛКСМБ. Працаваў пад кіраўніцтвам ЦК ВЛКСМ і ЦК КПБ. Пленум ЦК ЛКСМБ склікаўся не радзей як 1 раз у 4 месяцы, выбіраў Бюро і Сакратарыят ЦК, зацвярджаў заг. аддзелаў і рэдактараў рэсп. камсамольскіх выданняў. Арганізоўваў выкананне рашэнняў ЦК ВЛКСМ і ЦК КПБ, з'ездаў ВЛКСМ і ЛКСМБ, праводзіў паліт., арганізатарскую, ідэйна-выхаваўчую і культ.-масавую работу сярод моладзі. Паміж з'ездамі кіраваў камсам. арг-цыямі рэспублікі, кантраляваў іх дзейнасць, заслухоўваў справаздачы абкомаў, гаркомаў і райкомаў ЛКСМБ, практычна дапамагаў ім у рабоце. ЦК ЛКСМБ размяркоўваў сродкі бюджэту камсамола рэспублікі, сістэматычна інфармаваў і рабіў справаздачы аб сваёй дзейнасці перад ЦК ВЛКСМ, ЦК КПБ і з'ездам ЛКСМБ. На XXX з'ездзе (1991) ЛКСМБ перайменаваны ў *Саюз моладзі Беларусі* (СМБ) і ўтворaны ЦК СМБ. На XXXI (устаноўчым) з'ездзе (1992) прыхільнікі камуніст. кірунку адрадзілі ЛКСМБ як грамадска-паліт. арг-цыю моладзі і ЦК ЛКСМБ.

ЦЭНТРА́ЛЬНЫ КАМІТЭ́Т САВЕ́ЦКІХ ВАЕННАПАЛО́ННЫХ у Францыі, антыфашысцкая нелегальная арг-цыя сав. ваеннапалонных у складзе *руху Супраціўлення* на тэр. Францыі, акупіраванай ням. фашыстамі, у снеж. 1943 — снеж. 1944. Створаны па ініцыятыве Франц. камуніст. партыі ў Парыжы. Кіраўнікі: В.В.Порык (загінуў, пасмяротна Герой Сав. Саюза, 1964), І.М.Скрыпай і інш. К-т арганізоўваў уцёкі і паўстанні ваеннапалонных, партыз. атрады, выдаваў газ. «Советский патриот».

ЦЭНТРА́ЛЬНЫ МУЗЕЙ УЗБРО́ЕНЫХ СІЛ (ЦМУС). Засн. ў Маскве 23.12.1919 як выстаўка-музей «Жыццё Чырвонай Арміі і Флоту». З 1924 — Цэнтр. ваен. музей. Сучаснае памяшканне пабудавана ў 1965. Ваен.-гіст. калекцыі складаюць больш за 750 тыс. экспанатаў (1999), у т.л. каля 50 тыс. твораў выяўл. мастацтва, 10 тыс. адзінак зброі і тэхнікі, 30 тыс. баявых сцягоў. У б-цы больш за 100 тыс. тамоў. У 1990-я г. фонды папоўнены прадметамі і дакументамі па гісторыі рас. арміі, войск белага руху, Узбр. сіл Рас. Федэрацыі і інш. Пры музеі дзейнічае Міжрэгіянальная асацыяцыя ваен.-гіст. клубаў. Выдае метадычную літ. ў дапамогу вайск. (флоцкім) музеям. Гл. таксама *Музей ваеннай гісторыі Рэспублікі Беларусь.*

ЦЭНТРА́ЛЬНЫ НАЦЫЯНА́ЛЬНЫ КАМІТЭ́Т У ВАРША́ВЕ (ЦНК, Komitet Centralny narodowy), канспіратыўны цэнтр падрыхтоўкі і кіраўніцтва *паўстаннем 1863—64* у Польшчы, на Беларусі і ў Літве. 17.10.1861 у Варшаве па ініцыятыве пісьменніка А.Кажанёўскага *«чырвоныя»* стварылі гар. к-т (камітэт руху), які ў маі 1862 пераўтвораны ў ЦНК. Яго арганізатары І.Хмяленскі і Я.*Дамброўскі*. Склад і структура к-та часта мяняліся. У чэрв. 1862 ЦНК прыняў план Дамброўскага аб неадкладным узбр. паўстанні, які адхілілі памяркоўныя элементы. У ЦНК побач з паслядоўнымі рэвалюцыянерамі (С.Баброўскі, З.*Падлеўскі*, Б.*Шварцэ*) вял. ўплыў мелі прадстаўнікі правага крыла «чырвоных» (А.*Авейдэ*, А.*Гілер*). Гэта адбілася на сац. і нац. праграме паўстання, выпрацаванай ЦНК, якая стала палавінчатай. Дэкларуючы раўнапраўе бел., літ. і ўкр. народаў, к-т імкнуўся пашырыць сваю ўладу на тэр. Рэчы Паспалітай у межах 1772, супраць чаго паўстаў віленскі к-т «чырвоных» (К.*Каліноўскі*). ЦНК падтрымліваў сувязі з *Камітэтам рускіх афіцэраў у Польшчы*, з рус. рэв. цэнтрам у Лондане (А.І.Герцэн, М.П.Агароў), з ЦК «Зямлі і волі» ў Пецярбургу. У пачатку паўстання (22.1.1863) к-т абвясціў сябе Часовым нац. урадам, у якім з сак. 1863 вял. ўплыў набылі *«белыя»*. З 10.5.1863 к-т афіцыйна наз. Нацыянальным урадам. У 1862—63 к-т канспіратыўна выпускаў газ. «Ruch» («Рух», рэдактар Гілер).

Літ.: Показания и записки о польском восстании 1863 г. Оскара Авейде. М., 1961; Dokumenty Komitetu Centralnego Narodowego i Rządu Narodowego, 1862—1864. Wrocław etc., 1968.

Г.В.Кісялёў.

ЦЭНТРА́ЛЬНЫ САЮ́З КУЛЬТУ́РНЫХ І ГАСПАДА́РЧЫХ АРГАНІЗА́ЦЫЙ, Цэнтрасаюз, грамадска-паліт. арг-цыя бел. нац. руху правацэнтрысцкага кірунку ў Зах. Беларусі. Створаны ў сярэдзіне 1930 у сувязі з выбарамі ў польскі сейм. Цэнтр. друкаваны орган — газ. «Беларускі звон». Стварэнне Цэнтрасаюза азначала расколу бел. нац.-вызв. руху, які адбыўся ва ўмовах рэспрэсіўнай палітыкі *«санацыйнага рэжыму»* і распачатых *рэпрэсій палітычных* супраць бел. інтэлігенцыі ў БССР, а таксама курсу КПЗБ на фарсіраванне рэв. працэсу ў краі. Лідэры саюза Р.Астроўскі, А.Луцкевіч, Ф.Акінчыц, Я.Станкевіч лічылі адзіна магчымым шляхам культ.-нац. развіцця пошук кампрамісаў з урадам Ю.Пілсудскага. Пад арганізац. уплывам Цэнтрасаюза знаходзіліся *Таварыства беларускай асветы*, *Беларускае навуковае таварыства*, *Беларускае дабрачыннае таварыства*, *Беларускі студэнцкі саюз*, інш. культ.-асв. т-вы і суполкі. Правал Цэнтрасаюза на выбарах у польскі сейм у ліст. 1930, узмацненне пазіцыйных розпагалоссяў прывялі да яго расколу ў пач. 1934.

У.Ф.Ладысеў.

ЦЭНТРА́ЛЬНЫ ТЭА́ТР ЛЯ́ЛЕК імя С.У.Абразцова. Створаны ў 1931 у Маскве, з 1981 акад., з 1992 імя С.У.*Абразцова*, які ў 1931—92 узначальваў т-р. Рэпертуар эстр.-канцэртнай, гераіка-рамант., сатыр. накіраванасці, разлічаны на дзіцячую і дарослую аўдыторыю. Сярод спектакляў для дзяцей: «Кот у ботах» Г.Уладычынай (1937), «Церам-Церамок» С.Маршака (1940), «Вясёлыя медзведзяняты» М.Паліванавай (1945), «Хітры Вожык» Н.Гернет і Я.Спяранскага (1979), «Маўглі» паводле Р.Кіплінга (1987), «Тыграня Петрык» Гернет паводле Г.Янушэўскай і Я.Вількоўскага (2000), «Братка Трусік» Б.Галдоўскага паводле Дж.Харыса (2003), для дарослых: «Чароўная лямпа Аладзіна» Гернет (1940), «Кароль-алень» Спяранскага паводле К.Гоцы (1943), «Звычайны канцэрт» А.Бондзі і З.Герта (1946, 1952; яго новая рэдакцыя — «Незвычайны канцэрт» Абразцова, Бондзі, З.Паперната, Герта і У.Кусава, 1968), «Боская камедыя» І.Штока (1961), «Шлягер, шлягер, толькі шлягер» А.Хайта (1985), «Геракл» М.Барценева (1994), «Камедыя памылак» У.Шэкспіра (1998), «Вялікі перасмешнік» Галдоўскага і К.Абразцовай па кн. Абразцова «Па прыступках памяці» (2001), «Тыль» Р.Горына (2002) і інш. У трупе т-ра ў розныя гады нар. арт. СССР Герт, нар. арт. Расіі Кусаў, С.Самадур, Спяранскі, засл. арт. Расіі Н.Абразцова, І.Зайцаў, І.Мазінг, Е.Сінельнікава, К.Успенская, рэж. К.Абразцова, Ф.Віёлін, А.Дзеннікаў, маст. Б.Тузлукаў, А.Спешнева. З 1937 пры т-ры працуе музей тэатр. лялек. На фасадзе будынка т-ра ўстаноўлены гадзіннік з завадзнымі лялькамі — адна са славутасцей Масквы.

Цэнтральны тэатр лялек імя С.У.Абразцова. Гадзіннік на фасадзе будынка тэатра.

Літ.: Смирнова Н.И. Театр Сергея Образцова. М., 1971; Хорт А., Голдовский Б. Не только куклы. М., 2001; Духанина Л. Кукольное братство двадцатого века // Куклы и театр. М., 2002.

ЦЭНТРА́ЛЬНЫ ТЭА́ТР РАСІ́ЙСКАЙ А́РМІІ акадэмічны. Створаны ў 1929 у Маскве як Цэнтр. т-р Чырв. Арміі, з 1951 Цэнтр. т-р Сав. Арміі, з 1975 акад., з 1993 сучасная назва. Гал. рэжысёры: Ю.Завадскі (1932—35), А.Папоў (1935—58), Б.Марозаў (з 1995), маст. кіраўнікі: А.Дунаеў (1959—62), Папоў (1962—73), Р.Гараеў (1974—78), Ю.Яромін (1981—87), Л.Хейфец (1988—94); вядучы рэжысёр А.Бурдонскі (з 1994). Засн. для абслугоўвання Чырв. Арміі, спектаклі даваліся ў ваен. гарнізонах, часцях, пагран. заставах. Вял. ўплыў на творчы рост калектыву Завадскага; пастаўлены ім у 1932 спектакль «Мсціслаў Удалы» І.Прута стаў этапным. Значнае месца ў рэпертуары займала ваен.-патрыят. тэматыка: «Даўным-даўно» А.Гладкова (1942), «Барабаншчыца» А.Салынскага (1957), «Акіян» А.Штэйна (1961), «Валакаламск—Масква» А.Бека (1966) і інш. Ставяцца рус. і замежная класіка, сучасная драматургія. Сярод лепшых спектакляў «Мяшчане» (1935) і «На дне» (1998) М.Горкага, «Утаймаванне свавольніцы» (1937), «Сон у летнюю ноч» (1941) і «Атэла» (1999) У.Шэкспіра, «Настаўнік танцаў» Лопэ дэ Вэгі (1946), «Каса марэ» (1961) і «Святая святых» (1977) І.Друцэ, «Вішнёвы сад» А.Чэхава (1965), «Смерць Іаана Грознага» (1966) і «Дон Жуан» (1996) А.К.Талстога, «Арфей спускаецца ў пекла» Т.Уільямса (1978), «Радавыя» А.Дударава (1985), «Павел I» Дз.Мережкоўскага (1989), «На бойкім месцы» (1994) і «Сэрца не камень» (1997) А.Астроўскага, «Запрашэнне ў замак» Ж.Ануя (1999), «Дуэт для саліstкі» Т.Кемпінскі (2000) і інш. У розныя гады ў т-ры працавалі і працуюць акцёры Л.Галубкіна, Л.Дабржанская, Д.Зяркалава, Л.Касаткіна, І.Ледагораў, А.Меньшыкаў, А.Пакроўская, А.Пятроў, Ф.Ранеўская, Н.Сазонава, У.Сашальскі, Л.Фяцісава, А.Хахлоў, Ф.Чаханкоў, Л.Чурсіна і інш. З 1940 працуе ў спец. пабудаваным будынку, які ў плане ўяўляе сабой 5-канцовую зорку.

Л.В.Календа.

ЦЭНТРА́ЛЬНЫ ФРАНЦУ́ЗСКІ МАСІ́Ў, Цэнтральны масіў (Massif Central), горны масіў у цэнтры і на Пд Францыі. Базальтавыя плато і цокальныя пласкагор'і, над якімі ўзвышаюцца конусы стараж. патухлых вулканаў. Выш. да 1886 м (г. Пюі-дэ-Сансі). На Пд карставае плато Кос, на ПдУ горы Севены, на Пн і ПнЗ пласкагор'і Марван, Лімузен, Мільваш і інш.

Адзін з найбуйн. стараж. масіваў, уваходзіць у склад *Заходне-Еўрапейскай маладой платформы*. Фарміраваўся пад уплывам шматлікіх праяўленняў складкавасці, магматызму і метамарфізму. Паўн. ч. (Авернскае

ядро) складзена з крышт. сланцаў, змятых у складкі ў дакембрыі, пранізаных гранітнымі інтрузіямі. Кансалідаваны ў каменнавугальны перыяд. У кайназойскую эру ў выніку агульнага падняцця раскалоўся на шматлікія глыбы, стаў арэнай інтэнсіўнага вулканізму. Радовішчы уранавых руд, каменных вугляў, буд. матэрыялаў і інш. Клімат умераны, акіянічнага тыпу. Лета халаднаватае (сярэдняя т-ра ліп. 11—16 °С), зімой маразы і снегапады чаргуюцца з адлігамі (сярэдняя т-ра студз. 0 °С). Ападкаў на наветраных схілах выпадае 1200—1500 мм за год, у катлавінах — 500—700 мм. У Ц.Ф.м. бяруць пачатак шматлікія рэкі Францыі (Луара, правыя прытокі Гароны, Роны і інш.). Да выш. 1000—1200 м шыракалістыя (дуб, бук, каштан) і хвойныя лясы, да 1400 м — піхтавыя лясы, якія вышэй змяняюцца хмызнякамі і альпійскімі лугамі. Лясы амаль зведзены, укрываюць 10—15% плошчы, чаргуюцца з с.-г. ўгоддзямі і лугамі. На плато Кос стэпавыя лугі, на паўд. і паўд.-ўсх. схілах зараснікі хмызняку тыпу *гарыга*. Мінер. крыніцы, курорты (Вішы, Мон-Дор і інш.).

Будынак **Цэнтральнага тэатра Расійскай Арміі.**

ЦЭНТРА́ЛЬНЫ ФРО́НТ, аператыўна-стратэгічнае аб'яднанне сав. войск у Вял. Айч. вайну на зах. напрамку. Ц.ф. 1-га фарміравання створаны 24.7.1941 у выніку падзелу Зах. фронту. Яго ўпраўленне створана на базе ўпраўлення 4-й арміі. У склад фронту ўвайшлі 13-я, 21-я, 3-я арміі і група ВПС. 21-я армія працягвала пачатую 13.7.1941 *Рагачоўска-Жлобінскую аперацыю 1941*, наносіла контрудары ў напрамку Бабруйска. З 24.7.1941 войскі фронту ўдзельнічалі ў *Смаленскай бітве 1941*. 8.8.1941 ням. войскі прарвалі Ц.ф. і выйшлі ў тыл. Паўд.-Зах. фронту. 25.8.1941 Ц.ф. скасаваны, яго палявое ўпраўленне перададзена *Бранскаму фронту*. Ц.ф. 2-га фарміравання створаны 15.2.1943 на базе скасаванага Данскога фронту. У яго склад увайшлі 21-я, 65-я, 70-я агульнавайск., 2-я танк. і 16-я паветр. арміі, якія разгарнуліся на ПнЗ ад г. Курск. Пазней у склад фронту ў розныя тэрміны ўваходзілі 3-я, 13-я, 45-я, 50-я, 60-я, 61-я, 63-я агульнавайск. і 3-я гвардз. танк. арміі. У лют.—сак. 1943 войскі фронту ўдзельнічалі ў зімовым наступленні, летам — у *Курскай бітве 1943*, Арлоўскай наступальнай аперацыі, сумесна з войскамі Бранскага і Зах. франтоў арміі Ц.ф. разгромілі арлоўскую групоўку праціўніка і ліквідавалі Арлоўскі выступ праціўніка. 26.8—30.9.1943 войскі фронту правялі *Чарнігаўска-Прыпяцкую аперацыю 1943*, у выніку якой выйшлі да Дняпра, Прыпяці, Сажа і стварылі спрыяльныя ўмовы для вызвалення Беларусі і Правабярэжнай Украіны. 20.10.1943 Ц.ф. перайменаваны ў *Беларускі фронт*. Камандуючыя Ц.ф.: ген.-палк. Ф.І.*Кузняцоў* (ліп.—жн. 1941), ген.-лейт. М.Р.*Яфрэмаў* (жн. 1941); ген.-палк., з 28.4.1943 ген. арміі К.К.*Ракасоўскі* (люты—кастр. 1943).

ЦЭНТРА́ЛЬНЫ ЦЫЛІ́НДР, стэла, восевы цыліндр у батаніцы, цэнтральная частка сцябла і кораня (першаснай будовы) вышэйшых раслін, якую акружае першасная кара. Складаецца толькі з праводных элементаў (напр., пратастэла) або ўключае парэнхімную сярэдзіну і слой клетак першаснай мерыстэмы (гл. *Перыцыкл*).

ЦЭНТРА́ЛЬНЫ ШТАБ ПАРТЫЗА́НСКАГА РУ́ХУ (ЦШПР), ваенна-аператыўны орган па кіраўніцтве партыз. рухам на акупіраванай тэр. СССР у Вял. Айч. вайну. Утвораны 30.5.1942 пры Стаўцы Вярх. галоўнакамандавання Чырв. Арміі паводле пастановы ЦК ВКП(б) і Дзярж. К-та Абароны. Дзейнічаў да 13.1.1944 (7.3.1943 расфарміраваны, 17.4.1943 адноўлены). Нач. штаба 1-ы сакратар ЦК КП(б)Б П.К.*Панамарэнка*. Гал. задачы ЦШПР: ажыццяўленне мерапрыемстваў па развіцці партыз. руху, каардынацыя і павышэнне эфектыўнасці баявых дзеянняў партызан, арганізацыя ўзаемадзеяння з Чырв. Арміяй, вывучэнне, абагульненне і распаўсюджванне вопыту партыз. барацьбы. ЦШПР меў радыёвузел, пункт збору рэзерваў, экспедыцыйна-трансп. базу, 4 школы па падрыхтоўцы арганізатараў партыз. руху, падрыўнікоў, разведчыкаў, сувязістаў (у 1942 іх скончыла больш за 6 тыс. чал.). Штаб дзейнічаў у кантакце з кіруючымі парт. і сав. органамі рэспублік і абласцей, ваен. саветамі франтоў і армій, кіраваў падначаленымі яму рэсп. і абл. штабамі партыз. руху, у т.л. *Беларускім штабам партызанскага руху*. Пры неабходнасці праводзіў перагрупоўку партыз. сіл, забеспячэнне іх зброяй, боепрыпасамі, медыкаментамі і інш.

ЦЭНТРА́ЛЬНЫЯ КАРДЫЛЬЕ́РЫ А́НДАЎ, унутраныя хрыбты *Андаў* у межах Калумбіі, Перу і Балівіі, дзе іх часам наз. Усх. Кардыльерамі (у Эквадоры, дзе Анды звужаюцца, Ц.К.А. амаль што не выражаны). Грабяні хрыбтоў на вяршынях 3500—4500 м, асобныя вяршыні да 5000 м і болей (вулкан Уіла — 5750 м). Шмат дзеючых і патухлых вулканаў. Вільготныя вечназялёныя лясы (пераважна на ўсх. схілах), сухія лясы, рэдкалессі, хмызняковыя стэпы.

ЦЭНТРА́ЛЬНЫЯ РАЎНІ́НЫ. У Паўн. Амерыцы (на тэр. ЗША і Канады) паміж Апалачамі на У, Вялікімі раўнінамі на З, Лаўрэнційскім узв. на Пн і ПнУ і Прымексіканскай нізінай на Пд. Пераважаюць выш. 150—500 м. Ц.р. адпавядаюць паўд. ч. *Паўночна-Амерыканскай платформы*. Радовішчы кам. вугалю, нафты, газу, кухоннай солі, свінцова-цынкавых руд і барыту.

Паўн. ч. Ц.р. фарміравалася пад уздзеяннем антрапагенавых зледзяненняў. Тут пашыраны марэнна-ўзгорысты рэльеф са шматлікімі азёрамі тэктона-ледавіковага паходжання (Вялікія азёры, Вініпег, Вініпегосіс, Манітоба і інш.). На Пд ад мяжы стараж. зледзянення распасцірающца зандравая раўніна, укрытая лёсамі, парэзаная ярамі, і ўзвышаная раўніна, дзе выхады вапнякоў на паверхню ўтвараюць сталовыя плато (напр., Озарк) з эразійнымі і карставымі формамі. На Пд плато Озарк горы Бостан (выш. да 825 м). Клімат умераны кантынент., на крайнім Пд — субтрапічны. Сярэдняя т-ра студз. ад -20 °С на Пн да 4 °С на Пд, ліп. адпаведна 19 і 26 °С. Ападкаў 400—1200 мм за год. Б.ч. тэрыторыі раўнін у межах бас. р. Місісіпі, якая разам з прытокамі ўтварае разгалінаваную сістэму водных шляхоў. На Пн рэкі Св. Лаўрэнція і Нельсан. Глебы бурыя, лясныя і чарназёмападобныя. На Пн участкі мяшаных лясоў з дуба, клёна, ліпы, гемлока, елкі і хвоі. На марэнных узгорках ялова-піхтавыя лясы, па далінах рэк — дубова-гікорыевыя зараснікі. На Пд Ц.р. зона высакатраўных прэрый, якія амаль што зведзены ў выніку разворвання і засялення тэрыторыі. Ц.р. — адзін з гал. с.-г. раёнаў ЗША і Канады (збожжавая гаспадарка і жывёлагадоўля), больш за $^3/_4$ тэр. пад ворывам і пашамі. *М.В.Лаўрыновіч.*

ЦЭНТРАМЕ́РА (ад *цэнтр* + грэч. meros частка, доля), кінетахор, участак *храмасомы*, які кантралюе яе рух да розных полюсаў клеткі на працягу дзялення — *мітозу* ці *меёзу*; месца, дзе прымацоўваюцца да храмасомы ніці (мікратрубачкі) *верацяна дзялення*. Мае выгляд ахраматычнай дэспіралізаванай перацяжкі. Адрозніваюць храмасомы з лакалізаванай Ц. і дыфузнай. Змена становішча Ц. ў пэўнай храмасоме — крытэрый выяўлення храмасомных перабудоў. Храмасомы без Ц. не здольныя ўдзельнічаць у мітозе. *А.С.Леанцюк.*

ЦЭНТРАСАЮ́З, гл. *Цэнтральны саюз культурных і гаспадарчых арганізацый.*

ЦЭНТРАСІБІ́Р, Цэнтральны выканком Саветаў Сібіры, вышэйшы орган сав. улады ў Сібіры. Створаны ў кастр. 1917 на I-м з'ездзе Саветаў Сібіры ў г. Іркуцк, старшыня Б.З.Шумяцкі. Пад націскам чэхаславацкіх (гл. *Чэхаславацкага корпуса мяцеж* 1918) і белагвардз. войск летам 1918 эвакуіраваўся ў г. Верхнеудзінск (цяпер Улан-Удэ), потым у г. Чыта. Скасаваны 28.8.1918.

ЦЭНТРАСО́МА (ад *цэнтр* + *сома*), цэнтрасфера, цэнтраплазма, клетачны цэнтр, участак

цытаплазмы клеткі, што акружае *цэнтрыёлі*. Размешчана побач з *ядром*, звычайна мае больш шчыльную структуру, чым астатняя цытаплазма. Пры мікрахірург. аперацыях яе можна расцягваць і перасоўваць. Удзельнічае ў фарміраванні *верацяна дзялення*.

ЦЭНТРАФЛО́Т, Цэнтральны выканком ваеннага флоту пры ЦВК Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Расіі, выбарны орган, створаны ў чэрв. 1917 на 1-м Усерас. з'ездзе Саветаў са складу яго дэлегатаў — прадстаўнікоў флатоў і флатылій. Большасць чл. Ц. складалі эсэры і меншавікі. Распушчаны ў ліст. 1917 ваен. маракамі — дэлегатамі 2-га Усерас. з'езда Саветаў па патрабаванні У.І.Леніна. Замест Ц. створаны Ваен.-марскі рэв. к-т на чале з бальшавіком І.І.Вахрамеевым.

«ЦЭНТР — ПО́ЎДЗЕНЬ», мерыдыянальная чыг. магістраль, якая злучае 4 краіны Паўд. Афрыкі: Ілеба—Лубумбашы (Дэмакр. Рэспубліка Конга) — Лусака (Замбія) — Булавайо (Зімбабве) — Габароне (Батсвана). Працягласць 2,8 тыс. км. Пабудавана ў 1920—40-я г. Праз Батсвану мае выхады да партоў Паўд. Афр. Рэспублікі; у Замбіі і Зімбабве стыкуецца з чыгункамі, што вядуць да партоў Анголы і Мазамбіка.

ЦЭ́НТРЫ ДЗЕ́ЙНАСЦІ АТМАСФЕ́РЫ, вялікія вобласці атмасферы з пераважай *антыцыклонаў* або *цыклонаў*; адлюстроўваюць найб. устойлівыя асаблівасці агульнай *цыркуляцыі атмасферы*. Адрозніваюць пастаянныя (перманентныя) Ц.дз.а., што праяўляюцца на працягу ўсяго года — экватарыяльная дэпрэсія, субтрапічныя і часткова трапічныя вобласці высокага атм. ціску Паўн. і Паўд. паўшар'яў (*Азорскі антыцыклон, Гавайскі антыцыклон*, Паўд.-Атлантычны, Паўд.-Інд. і Паўд.-Ціхаакіянскі антыцыклоны), дэпрэсіі субпалярных шырот (*Алеуцкая дэпрэсія, Ісландская дэпрэсія*, Субантарктычная дэпрэсія), палярныя вобласці высокага атм. ціску (*Арктычны антыцыклон, Антарктычны антыцыклон*), а таксама сезонныя Ц.дз.а. (*Азіяцкі антыцыклон*, Канадскі антыцыклон). Ц.дз.а. значна ўплываюць на размеркаванне паветраных цячэнняў, на надвор'е і клімат вял. рэгіёнаў Зямлі.

ЦЭНТРЫЁЛЬ, пастаянная структура *клетак* усіх жывёл і некат. раслін; асн. ч. клетачнага цэнтра. Звычайна ў клетцы 2 або некалькі Ц., якія акружаны дыферэнцыраваным участкам *цытаплазмы*, што ўтварае цэнтрасферу.

Мае цыліндрычную форму. Удзельнічае ў дзяленні клеткі; пры дзяленні Ц. разыходзяцца да полюсаў клеткі, вызначаюць вось *верацяна дзялення*. Пры апладненні (многаклетачныя арганізмы) Ц. уносіцца ў *зіготу* мужчынскай палавой клеткай. У дыплоіднай клетцы знаходзяцца 2 пары Ц., у кожнай пары адна Ц. спелая, мацярынская, другая — няспелая, даччыная. *А.С.Леанцюк.*

ЦЭНТРЫ́ЗМ, 1) у сучаснай паліталогіі агульная назва розных паліт. плыней, якія ў паліт. спектры сваёй краіны займаюць прамежкавае становішча паміж *«левымі» і «правымі»*. У залежнасці ад паліт. сітуацыі цэнтрысты ўтвараюць блокі з «правымі» або «левымі», утвараючы права- ці левацэнтрысцкую большасць ў парламенце. У парламенцкіх дзяржавах на аснове гэтай большасці фарміруюцца і адпаведныя ўрады. Часам моцны «цэнтр» здольны праводзіць самаст. палітыку і ўтвараць уласныя ўрады. 2) У міжнар. рабочым руху прамежкавая плынь паміж рэв. *марксізмам* і правым *апартунізмам*. Узнік у пач. 20 ст. ў ходзе барацьбы паміж рэв. марксізмам і *рэвізіянізмам* у партыях *Інтэрнацыянала 2-га*. Цэнтрысты імкнуліся захаваць адзінства рабочага руху шляхам згладжвання супярэчнасцей паміж імі. Асн. кірунак Ц. ў міжнар. рабочым руху — каўцкіянства (гл. *Каўцкі* К.). У 1-ю сусв. вайну цэнтрысты, разам з інтэрнацыяналістамі, асуджалі як несумяшчальную з прынцыпамі пралет. *інтэрнацыяналізму* падтрымку лідэрамі асн. партый Інтэрнацыянала 2-га ваен. намаганняў урадаў сваіх краін, але адмаўляліся парваць з імі. За такую «палавінчатасць» іх крытыкавалі У.І.*Ленін* і яго прыхільнікі, з якімі цэнтрысты ў 1915—19 знаходзіліся ў складзе т.зв. Цымервальдскага аб'яднання (гл. *Цымервальдская канферэнцыя*). У 1921 цэнтрысты многіх еўрап. краін і ЗША утварылі *«Інтэрнацыянал 2 1/2»*.

ЦЭНТРЫФУ́ГА (ад *цэнтр* + лац. fuga бег), 1) апарат (установка, машына), дзеянне якой грунтуецца на цэнтрабежнай сіле, што ўзнікае пры вярчэнні *ротара*. Выкарыстоўваецца для *цэнтрыфугавання*.

Бываюць Ц. для адстойвання (асаджэння), фільтравання і сепаратарныя (гл. *Сепаратар*); перыядычнага і бесперапыннага дзеяння. Ротар Ц. — з падвойнымі сценкамі, сеткавы ці суцэльны, частата вярчэння 6000 аб/мін і больш. З дапамогай Ц. раздзяляюць суспензіі і эмульсіі, абязводжваюць матэрыялы ў хім., харч., горнай прам-сці, сельскай гаспадарцы, буд-ве, медыцыне і інш.

2) Наземная або бартавая (на лятальным апараце) установка, якая імітуе працяглае дзейнае паскарэнне. Выкарыстоўваецца для падрыхтоўкі, у т.л. вестыбулярнай трэніроўкі лётчыкаў і касманаўтаў, для выпрабавання рознай бартавой апаратуры, даследаванняў уплыву паскарэння на жывыя арганізмы і інш. Можа ствараць цэнтраімклівае паскарэнне да 400 м/с^2 і больш.

В.М.Кандрацьеў.



Схема **цэнтрыфугі** маслянага фільтра: 1 — ротар; 2 — выпаўшы асадак; 3 — вось ротара; 4 — маслазаборныя трубкі; 5 — маслападвадны канал; 6 — калібровачная адтуліна.

ЦЭНТРЫФУГАВА́ННЕ, раздзяленне неаднародных сістэм (суспензій, шламаў, эмульсій) пад дзеяннем цэнтрабежных сіл. Робіцца з мэтай вылучэння цвёрдай або асветленай фаз спосабам адстойвання ці фільтравання.

Выконваецца ў *цэнтрыфугах* з суцэльным або перфарыраваным (пакрытым фільтруючым матэрыялам) ротарам. Цэнтрабежнае адстойванне выкарыстоўваюць для вылучэння асветленай вадкай фазы з разбаўленых суспензій і асаджэння цвёрдай фазы з канцэнтраваных суспензій; фільтраванне — для выдалення цвёрдай фазы з суспензій і шламаў з адносна малой колькасцю вадкай фазы. Асобнае месца займае Ц. эмульсій, напр., сепарыраванне малака ў *сепаратарах малочных*. Пры даследаванні высокадысперсных сістэм і высокамалекулярных злучэнняў (бялкоў, нуклеінавых кіслот) выкарыстоўваюць *ультрацэнтрыфугаванне*. *В.М.Кандрацьеў.*

ЦЭНТРЫ́ЧНЫЯ ЗБУДАВА́ННІ, пабудовы, сіметрычныя адносна верт. восі ў цэнтры гал. памяшкання, якое дамінуе ў арх. кампазіцыі. Функцыян. і маст. значэнне Ц.з. можа быць выяўлена і ў плане (круг, квадрат, шматграннік ці больш складаная геам. фігура) і ў вонкавым выглядзе.

Найб. пашыраны ў відовішчных, выставачных і прамысл. збудаваннях, у культавай архітэктуры Сярэднага і Д.Усходу, Зах. і Усх. Еўропы (Італія, архітэктура Высокага Адраджэння).

На Беларусі Ц.з. вядомы са старажытнасці ў *крыжова-купальных храмах*, абарончай архітэктуры стыляў готыкі і рэнесансу. Найб. пашыраны ў канцы 18 — пач. 19 ст. (*Гомельскі Петрапаўлаўскі сабор, Моладаўская капліца, Слаўгарадская царква Раства Багародзіцы*).



Да арт. **Цэнтрычныя збудаванні**. Віла «Ратонда» каля г. Вічэнца (Італія). Архітэктар А.Паладыо. 16 ст.

Узор мемар. Ц.з. — капліца *Ляснянскага мемарыяльнага комплексу*. Сярод прыкладаў сучасных Ц.з. будынак творчага аб'яднання *«Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь»*, *Мінскі цырк*, Гомельскі цырк, павільёны Нац. выставачнага цэнтра «БелЭкспа» і крытага рынку «Камароўскі», жылыя дамы па вул. Веры Харужай у Мінску. *Т.В.Габрусь.*

ЦЭНТУРЫЁН (ад лац. centurio ад centum сто), камандзір *цэнтурыі* ці *маніпулы* ў *легіёне* Стараж. Рыма. У эпоху Рэспублікі Ц. прызначалі найб. храбрых і спрактыкаваных воінаў, здольных да камандавання. Мелі значныя правы, іх жалаванне ў 2—4 разы перавышала жалаванне радавых легіянераў. У перыяд

Рымскі цэнтурыён.

Імперыі Ц. быў першай пасадай на шляху ваен. кар'еры коннікаў. На флоце Ц. камандаваў экіпажам карабля. *А.Г.Зельскі.*

ЦЭНТУ́РЫЯ, 1) ваенна-паліт. адзінка падзелу грамадзян у Стараж. Рыме. Паводле ант. традыцыі ў 8—6 ст. да н.э. на Ц. падзялялася рым. конніца. У выніку рэформы *Сервія Тулія* (6 ст. да н.э.) Ц. стала агульнавайск. і выбарчай адзінкай: усе грамадзяне былі падзелены на 5 маёмасных разрадаў, якія выстаўлялі вызначаную колькасць Ц. і мелі адпаведную колькасць галасоў у цэнтурыяльных *каміцыях*. Было ўтворана 193 Ц., да сярэдзіны 3 ст. да н.э. іх колькасць павялічылася да 373. 2) Асн. арганізац. адзінка войска Стараж. Рыма ў 6—4 ст. да н.э. і ніжэйшая арганізац. адзінка *легіёна* з 4 ст. да н.э. Ц. звычайна налічвала 60 чал., у легіёне складала $^1/_6$ *кагорты* або $^1/_2$ *маніпулы*. На чале Ц. стаяў *цэнтурыён*. *А.Г.Зельскі.*

ЦЭНУРО́ЗЫ, *гельмінтозы* жывёл, зрэдку чалавека, што выклікаюцца лічынкамі *стужачных чарвей* роду Multiceps (цэнурамі). На Беларусі адзначаецца Ц. ц э р э б р а л ь н ы, найб. пашыраны сярод авечак і коз, т.зв. «вярцячка».

Чалавек і жывёлы заражаюцца пры ўжыванні ежы і вады, забруджаных фекаліямі (пераважна сабак, ваўкоў, лісоў і інш.), дзе ўтрымліваюцца яйцы гельмінтаў. У кішэчніку з яец выходзяць зародкі, якія з крывёй разносяцца па арганізме. У галаўным і спінным мозгу, воку, мышцах, брушной поласці, падскурнай клятчатцы зародкі ператвараюцца ў цэнуры (буйныя пухіры з вадкасцю — кісты з зародкавымі галоўкамі). Лячэнне хірургічнае. *І.М.Семяненя.*

ЦЭП, 1) у сялянскім побыце ўсх. славян і інш. народаў драўляная прылада, якою малацілі збажыну. Да цапільна (даўж. да 2 м) прывязваўся сырамятным

Цапы.

Да арт. **Цэп**: Фрагмент малюнка В.Ляхора. 1999.

рэменем (гужыкам) біч (да 0,8 м). 2) Ц. б а я в ы — звычайная с.-г. прылада, біч і ч. цапільна якой аснашчаны вострымі шыпамі або акаваны жалезам. Шырока выкарыстоўваўся як зброя ў войнах сярэдневякоўя, у т.л. на Беларусі. Умелы воін баявым Ц. мог плюшчыць рыцарскія латы разам з іх гаспадаром.

ЦЭ́ПАВА Галіна Іванаўна (27.3.1910, г. Ніжні Ноўгарад, Расія — 7.2.1985), бел. спявачка (мецца-сапрана). Засл. арт. Беларусі (1955). Скончыла Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва ў Маскве (1936). У 1938—62 салістка Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Яе выкананне вызначалася тэмпераментам, псіхал. дакладнасцю вобраза. У рэпертуары драм. і характарныя партыі: Часнікова («Страшны двор» С.Манюшкі), Ганка («Міхась Падгорны» Я.Цікоцкага), Хрысцінка («Кветка шчасця» А.Туранкова), Любаша («Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава), Канчакоўна («Князь Ігар» А.Барадзіна), Любоў, Салоха («Мазепа», «Чаравічкі» П.Чайкоўскага), Кармэн («Кармэн» Ж.Бізэ), Азучэна («Трубадур» Дж.Вердзі). *Л.П.Івашкоў.*

ЦЭПЕЛІ́Н (Zeppelin) Фердынанд (8.7.1838, г. Канстанц, Германія — 8.3.1917), нямецкі канструктар *дырыжабляў*. Граф, генерал. Скончыў ваен. акадэмію ў Людвігсбургу (1854). Прымаў удзел у *грамадзянскай вайне ў ЗША 1861—65* (на баку паўн. штатаў), аўстра-прускай (1866) і франка-прускай (1870—71) войнах. Распрацаваў канструкцыю дырыжабля жорсткай сістэмы з метал. каркасам, абцягненым тканінай. Унутры корпуса ў адсеках знаходзіліся балоны з газам. Першы яго дырыжабль (аб'ёмам 11 300 м^3) здзейсніў палёт у 1900; да 1914 пабудавана 25 дырыжабляў («цэпелінаў»), у т.л. 6 пасажырскіх. Ваен. дырыжаблі Ц. выкарыстоўвалі ў час 1-й сусв. вайны.

ЦЭПЕШ (Ţepeş ад рум. ţeapa кол), сапр. Д р а к у л Улад (1431—76), гаспадар Валахіі [1456—62, 1476]. Сын гаспадара Валахіі Улада Дракула [1436—46]. З надзвычайнай жорсткасцю змагаўся за цэнтралізацыю дзярж. улады і супраць уплывовых баяр. Мянушку «Ц.» («саджальнік на кол») атрымаў за свой садысцкі звычай караць людзей смерцю праз пасаджэнне на кол (паводле паданняў, часам караў па 10 і 30 тыс. чал. за адзін раз). Пабудаваў у Бухарэсце цытадэль (1459). У 1461 адмовіўся плаціць даніну тур. султану і выканаць яго загад аб прыездзе ў Стамбул, захапіў тур. крэпасці на правым беразе р. Дунай і жорстка расправіўся з мясц. балг. насельніцтвам; у 1462 адбіў уварванне тур. войск у Валахію. Здрада баяр прымусіла Ц. ўцячы ў Венгрыю, дзе да 1474 быў зняволены. У 1476 зноў гаспадар Валахіі. Забіты баярамі (паводле інш.

версіі, загінуў у баі з туркамі). Паданне аб тым, што Ц. піў кроў сваіх ворагаў, дало падставу англ. пісьменніку Б.Стокеру зрабіць яго прататыпам вампіра Дракулы ў рамане «Дракула» (1897).

В.В.Грынявецкі.

ЦЭ́ПНІ, саліцёры (Taeniidae), сямейства (па інш. сістэматыцы — атрад) класа стужачных чарвей тыпу плоскіх чарвей. 13 родаў, каля 100 відаў. Пашыраны ўсюды. На Беларусі найб. вядомыя Ц.: няўзброены, або бычыны (Taeniarhynchus saginatus), узброены, ці свіны (Taenia solium), — найб. небяспечныя для чалавека. Паразітуюць у органах і тканках паўзуноў, птушак, млекакормячых жывёл і чалавека (канчатковыя гаспадары). Узбуджальнікі *цэстадозаў*.

Цела даўж. ад 3 мм (3—7 члеңікаў) да 10 м (больш за 1 тыс. члеңікаў) пляскатае, стужкападобнае. Галоўка з 4 прысоскамі, у некаторых відаў хабаток з кручкамі. *Біягельмінты.* Гермафрадыты, палавыя залозы размешчаны ў кожным члеңіку цела. Цыкл развіцця са складаным ператварэннем з адным прамежкавым гаспадаром (грызуны, капытныя, радзей драпежнікі і інш.), у якіх зародак (анкасфера) ператвараецца ў лічынку (*цыстыцэрк*, цэнура, эхінакок і інш.). Ежу засвойваюць паверхняй цела. Чалавек заражаецца пры спажыванні недаваранага ці недасмажанага мяса, у якім паразітуюць лічынкі. Гл. таксама *Тэніідозы, Цыстыцэркоз, Эхінакакоз.*

Л.В.Кірыленка.



Цэпні: 1 — бычыны (а — галоўка, б — члеңік); 2 — свіны (а — агульны выгляд, б — галоўка).

ЦЭ́ПРА, другая назва ракі *Цапра* ў Нясвіжскім і Клецкім р-нах Мінскай вобл.

ЦЭ́РАСКІ Вітольд Карлавіч (9.5.1849, г. Слуцк Мінскай вобл. — 29.5.1925), расійскі астраном; пачынальнік даследаванняў і заснавальнік навук. школы па астрафотаметрыі ў Расіі. Чл.-кар. Пецярб. АН (1914). Скончыў Маскоўскі ун-т (1871), дзе выкладаў з 1882 (з 1889 праф.); з 1878 у астр. абсерваторыі ун-та (у 1891—1916 дырэктар). Навук. працы па астрафотаметрыі. Распрацаваў методыку фотаметрычных назіранняў, удасканаліў (1887) фатометр Цольнера (фатометр Цольнера—Ц.). Вызначыў бляск больш як 500 зорак, адзін з першых вызначыў зорную велічыню Сонца (1903) і ніжнюю мяжу яго т-ры (1895). Адкрыў існаванне т.зв. серабрыстых воблакаў (1885), 2 пераменныя зоркі (1892, 1901). Даследаваў метэоры, стварыў шэраг астр. інструментаў. Яго імем названы кратэр на адваротным баку Месяца.

В.К.Цэраскі.

Тв.: Избранные работы по астрономии. М., 1953.

Літ.: Перель Ю.Г. Выдающиеся русские астрономы. М.; Л., 1951. *М.М.Касцюковіч.*

ЦЭРАТАДО́Н (Ceratodon), род брыевых імхоў сям. дытрыхавых. Каля 20 відаў. Пашыраны ўсюды. На Беларусі 1 від — Ц. пурпурны (C.purpureus). Трапляецца на розных субстратах: глебе, вогнішчах, камянях, укрытых гумусам, гнілой драўніне і інш.

Ц. пурпурны — шматгадовая, двухдомная, лістасцябловая расліна, утварае зялёныя або карычняватыя дзярніпкі. Сцёблы выш. 1—3 см. прамастойныя, шматразова аблісцелыя. Ліспе прамаадыходнае, ланцэтнае, завостранае. Каробачка нахіленая, прадаўгавата-яйцападобная, на ножцы. Каўпачок шапачкападобны.

ЦЭ́РБЕР, Кербер, у старажытнагрэчаскай міфалогіі жудасны трохгаловы сабака-пачвара са змяіным хвастом і тулавам, усеяным змяінымі галовамі, які ахоўвае ўваход у падземнае царства мёртвых — *Аід*. Паводле міфаў, толькі асобным героям удалося перамагчы Ц.: *Геракл* звязаў яго, *Арфей* зачараваў сваімі спевамі, а адна з грэч. *сівіл*, каб дапамагчы *Энею*, усыпіла праснаком са снатворнай травой. У пераносным сэнсе Ц. — люты, няўмольны вартавы.

ЦЭРКА́РЫЯ, церкарый (ад грэч. kerkos хвост), лічынка *трэматод*, якая жыве свабодна. Даўж. 0,3—1 мм. Цела лістападобнае ці цыліндрычнае, хвост добра развіты. Лічынка (*мірацыдый*) развіваецца ў целе першага прамежкавага гаспадара (малюска), дзе надыходзіць 1-е (спарацыста) ці наступнае пакаленне (рэдыя) і ў іх у выніку *партэнагенезу* ўзнікае Ц. Яна актыўна плавае, пранікае ў цела другога прамежкавага гаспадара, дзе траціць хвост і ператвараецца ў інвазійную лічынку метацэркарый (у некаторых — у *адалескарый*).

ЦЭРКАСПАРО́ЗЫ, хваробы раслін, якія выклікаюцца паразітычнымі грыбамі з роду *цэркаспора*. Пашкоджваюць буракі, бульбу, вінаград, інжыр і інш. пладовыя і ягадныя культуры. Праяўляюцца плямістасцю на лісці, радзей на чаранках, сцёблах, пладах. Плямы акруглыя або прадаўгаватыя, разнастайных памераў і афарбоўкі, аблямаваныя. Пры моцным пашкоджанні раслін адмірае лісце, ападаюць плады. Заражэнне адбываецца ўлетку. Развіццю хваробы спрыяе цёплае вільготнае надвор'е. Узбуджальнікі Ц. зімуюць у расл. рэштках у выглядзе скопішчаў патоўшчаных *гіфаў* міцэлію. *Т.У.Шэндрык.*

ЦЭРКАСПО́РА (Cercospora), род недасканалых грыбоў сям. дэмацыевых. Каля 900 відаў. Пашыраны ўсюды. На Беларусі найб. вядомыя Ц.: баркуновая (C.meliloti), бульбяная (C.concors), бураковая (C.beticola), канюшыны (C.cebrina), прамяністая (C.radiata). Паразіты травяністых і дрэвавых раслін, узбуджальнікі *цэркаспарозаў*.

Міцэлій напачатку бясколерны, потым цямнее і ператвараецца ў строму. Развіваецца ўнутры расліны-гаспадара. *Канідыяносцы* простыя ці галінастыя, адзіночныя або ў пучках, утвараюць шараваты налёт. Падоўжаныя *канідыі* бясколерныя або афарбаваныя, шматклетачныя (да 36 клетак). *С.І.Бельская.*

Цэркаспарозы: 1 — бульбы; 2 — бурака.

ЦЭ́РНІКЕ (Zernicke) Фрыц (сапр. імя Фрэдэрык; 16.7.1888, Амстэрдам — 10.3.1966), галандскі фізік. Чл. Нідэрл. каралеўскай АН (1946), замежны чл.

Лонданскага каралеўскага т-ва (1956). Скончыў Амстэрдамскі ун-т (1912). У 1913—58 у Гронінгенскім ун-це (з 1920 праф.). Навук. працы па стат. механіцы, тэорыі вадкасцей, электрамагнетызме, оптыцы і матэм. статыстыцы. Прапанаваў метад фазавага кантрасту (1934) і вынайшаў фазава-кантрастны мікраскоп (1935), што зрабіла магчымым назіранне з дапамогай мікраскопа празрыстых бясколерных аб'ектаў. Яго імем названы кратэр на адваротным баку Месяца. Нобелеўская прэмія 1953.

М.М.Касцюковіч.

ЦЭРУСІ́Т (ад лац. cerrusa бялілы), белая свінцовая руда, мінерал класа карбанатаў, карбанат *свінцу*, $PbCO_3$. Змяшчае да 77,5% свінцу, прымесі цынку, стронцыю, кальцыю, серабра.

Цэрусіт.

Крышталізуецца ў рамбічнай сінганіі. Утварае суцэльныя масы, зярністыя агрэгаты, скарынкі, нацёкі і ўкрапанікі, радзей крышталі. Бясколерны празрысты або снежна-белы. Цв. 3—3,5. Шчыльн. 6,6 г/см^3. Крохкі. Гіпергенная паходжання. Руда на свінец. Радовішчы ў Аўстраліі, Намібіі, Балгарыі, Конга, ЗША, Расіі.

ЦЭ́РЫЙ (лац. Cerium), Ce, хімічны элемент III групы перыяд. сістэмы, ат.н. 58, ат.м. 140,115. Адносіцца да *лантаноідаў*. Прыродны Ц. — сумесь 4 стабільных нуклідаў з масавымі лікамі 136, 138, 140, 142; найб. пашыраны ^{140}Ce (88,48%) і ^{142}Ce (11,08%). У зямной кары 7.10^{-3}% па масе. Асн. мінералы — *манацыт* і бастнезіт. Адкрыты ў 1803 Ё.Я.*Берцэліусам* і ням. хімікам В.Гізінгерам, незалежна ад іх ням. хімікам М.Клапратам. Назва ад малой планеты *Цэрэры*.

Серабрыста-белы метал, $t_{пл}$ 798 °С. Вядомы 4 крышт. мадыфікацыі. Кампактны Ц. у паветры павольна акісляецца, пры 160—180 °С загараецца. Растварацца ў мінер. к-тах. Узаемадзейнічае з кіпнем, пры награванні — з галагенамі, халькагенамі, азотам, вугляродам з утварэннем вытворных Ce (III) і Ce (IV). Выкарыстоўваюць як кампанент сплаваў, лігатур (для мадыфікацыі сплаваў Al і Mg) і інш.

А.П.Чарнякова.

ЦЭРЭБРАЗІ́ДЫ (ад лац. cerebrum мозг + грэч. eidos выгляд), прыродныя арган. злучэнні з групы *глікаліпідаў*. Вугляводная ч. малекулы Ц. складзена з глюкозы або галактозы, ліпідная — з N-ацыліраванай насычанай або ненасычанай тлустай к-ты, *сфінгазіну* (або яго гамолага).

Белыя аморфныя рэчывы, не растваральныя ў вадзе, добра растваральныя ў арган. растваральніках. Маюцца ў большасці клетачных мембран чалавека і жывёл, найб. колькасць у белым рэчыве мозга і ў міэлінавых абалонках нерваў. Біясінтэз шляхам перанясення астаткаў цукру ад урыдзіндыфосфагексозы на сфінгазін. Адзначана назапашванне Ц. у мозгу, селязёнцы, печані пры некат. цяжкіх псіхічных захворваннях.

ЦЭРЭБРАСПІНА́ЛЬНАЯ ВА́ДКАСЦЬ, тое, што *спіннамазгавая вадкасць*.

ЦЭРЭЗІ́Н (ад лац. cera воск), сумесь гранічных вуглевадародаў C_{36}—C_{55}, пераважна разгалінаваных аліфатычных.

Воскападобнае рэчыва ад белага да карычневага колеру, $t_{пл}$ 65—85 °С. Не раствараецца ў вадзе і спіртах, добра раствараецца ў бензіне, абмежавана — у мінер. маслах. Атрымліваюць з азакерыту, петралатуму, «парафінавых пробак» (адкладаў, што ўтвараюцца ў трубаправодах пры здабычы і транспарціроўцы нафты) і інш. Выкарыстоўваюць як кампанент пластычных змазак, ізаляцыйны матэрыял у электра- і радыётэхніцы, у сумесі з парафінам для вырабу свечак, масцік; асабліва чыстыя гатункі — у выт-сці касметычных крэмаў, абалонак для сыру.

ЦЭРЭ́РА, у старажытнарымскай міфалогіі і рэлігіі багіня земляробства і ўрадлівасці. Ёй быў прысвечаны храм на Авенцінскім узгорку ў Рыме, дзе яна

Цэрэра. Мармур. 2—1 ст. да н.э.

шанавалася разам з інш. расл. італійскімі божаствамі Ліберам і Ліберай. У гонар Ц. рымляне штогод 19 крас. наладжвалі святы — цэрэаліі. У старажгрэч. міфалогіі Ц. адпавядае *Дэметра*.

ЦЭРЭ́РА, самая буйная *малая планета*. Першая па часе адкрыцця (№ 1; 1801, Дж.Піяцы, Італія). Папярочнік каля 1000 км. Адлегласць ад Сонца мяняецца ад 2,55 да 3,05 а.а. Перыяд абарачэння 4,6 года. Сярэдняя *зорная велічыня* ў процістаянні 7,4.

ЦЭРЭТЭ́ЛІ Акакій Растомавіч (21.6.1840, с. Схвітары Сачхерскага р-на, Грузія — 8.2.1915), грузінскі грамадскі дзеяч, паэт. Князь. У час навучання ў Пецярбургскім ун-це (1859—63) успрыняў ідэі рас. рэв. дэмакратыі. Пасля вяртання на радзіму (1864) адзін з заснавальнікаў (з І.*Чаўчавадзе*) груз. рэв.-дэмакр. плыні 1860—70-х г. «Цергдалеўлебі», якая выступала за сац. разняволенне і нац. вызваленне груз. народа. У 1897—1900 выдаваў час. «Акакіс цвіўры крэбулі» («Штомесячны зборнік Акакія»), у 1905 рэдагаваў сатыр. час. «Хумара» («Жартаўнік»). Літ. дзейнасць пачаў у 1858. Майстар грамадз. і любоўнай лірыкі; яго творы вылучаюцца народнасцю і музычнасцю. Вызв. ідэямі прасякнуты гіст. паэмы «Торніке Эрыставі» (1884), «Расказ Кікала» (1889), «Натэла» (1900), аповесць «Башы-Ачукі» (1895—96), драма «Маленькі кахецінец» (1889). Аўтар п'ес «Каварная Тамара» (1885), «Медэя» (1896), аўтабіягр. аповесці «Перажытае» (1894—1909) і інш. Вершы «Светлячок», «Суліко» і інш. сталі нар. песнямі, «Далоў» — рэв. гімнам Грузіі. На бел. мову яго асобныя творы пераклалі Я.Сіпакоў, К.Цвірка.

Тв.: Рус. пер. — Избр. произв. Тбилиси, 1960; Стихотворения и поэмы. М.; Л., 1963; Лирика. М., 1965.

Літ.: Асатиани Л. Жизнь А.Церетели. Тбилиси, 1971.

ЦЭРЭТЭ́ЛІ Зураб Канстанцінавіч (н. 4.1.1934, г. Цулукідзе, Грузія), расійскі і грузінскі мастак. Засл. маст. Грузіі (1967). Нар. маст. СССР (1980). Герой Сац. Працы (1990). Правадз. чл. АМ СССР (1988, з 1992 Рас. АМ). Вучыўся ў Тбіліскай АМ (1952—1958). З 1997 прэзідэнт Рас. АМ. Манум.-дэкар. творы вызначаюцца вобразным адзінствам з арх. і пейзажным асяроддзем, яркасцю колераў, багаццем форм, разнастайнасцю матэрыялаў і тэхнік выканання: мазаічныя творы ў Тбілісі і Ульянаўску, афармленне дзіцячага комплексу ў Аллеры (1973), гасцінічнага комплексу «Ізмайлава» ў Маскве (1980) і інш. Аўтар манумента «Дружба навекі» (1983), сааўтар мемарыяльнага комплексу на Паклоннай гары (1995), афармлення Манежнай плошчы (1997), помніка Пятру I (1997) у Маскве. Дзярж. прэміі СССР 1970, 1982. Ленінская прэмія 1976. Дзярж. прэмія Расіі 1995.

ЦЭ́РЭУС (Cereus), род кветкавых раслін сям. кактусавых. Больш за 40 відаў. Пашыраны ў саваннах, камяністых пустынях, марскіх узбярэжжах Цэнтр. і Паўд. Амерыкі. Адзін з першых кактусаў, вядомых еўрапейцам (яго выява ёсць у траўніку 1588). На Беларусі ў пакоях і аранжарэях вырошчваюць Ц.Джа-

З.Цэрэтэлі. Помнік Пятру I у Маскве. 1997.

макару (C.jamacaru) і перуанскі (C.peruvianus).

Шматгадовыя дрэвападобныя або кустападобныя (часам сцелістыя) расліны выш. 1,7—

Цэрэус перуанскі.

20 м, дыям. да 40 см. Сцёблы рабрыстыя, з калючкамі, галінастыя ў аснове. Кветкі часцей белыя, буйныя, адзіночныя, раскрываюцца ноччу. Плод — ягадападобны, у некаторых відаў ядомы. Сцёблы выкарыстоўваюць на паліва. Дэкар. расліны.

ЦЭ́САРАЦ (Cesarec) Аўгуст (4.12.1893, Заграб — 17.7.1941), харвацкі пісьменнік, публіцыст, грамадскі дзеяч. У 1919 з М.*Крлежам* выдаваў час. «Plamen» («Полымя»), супрацоўнічаў у перыяд. друку «левіцы». Друкаваўся з 1909. У кнігах аповесцей і апавяд. «Судзіце мяне» (1925), «За новай дарогай» (1926), «Навелы» (1939), раманах «Імператарскае каралеўства» (1925), «Залаты юнак і яго ахвяры» (1928), «Уцекачы» (1933) і інш. сац. матывы, падпарадкаваныя духу часу. Аўтар зб. паэзіі «Вершы» (1919), п'есы «Сын айчыны» (1940), кніг публіцыстыкі «Са свету прыгнечаных» (1925), «Іспанскія сустрэчы» (1938), «Падарожжа па Савецкім Саюзе» (1940) і інш. Пераклада ў з ням., франц., чэш. і рус. моў.

Тв.: Рус. пер. — Тонкина любовь: Рассказы. М., 1961. *І.А.Чарота.*

ЦЭ́СІЯ (лац. cessio), 1) перадача крэдытарам (цэдэнтам) належнага яму права патрабавання другой асобе (цэсіянеру), якая становіцца новым крэдытарам. У адпаведнасці з цывільным правам Рэспублікі Беларусь Ц. магчыма, калі яна не супярэчыць закону або дагавору, а таксама калі перадача права не звязана непасрэдна з асобай крэдытора (напр., нельга ўступіць права на аліменты, на кампенсацыю прычыненай шкоды і да т.п.). Ажыццяўляецца па згодзе цэдэнта з цэсіянерам, што і даводзіцца да ведама даўжніка, згода якога пры гэтым не патрэбна, бо ён застаецца абавязаным у ранейшым аб'ёме і правамоцны перанесці на новага крэдытора ўсе пярэчанні, што ўзніклі да Ц. 2) У міжнар. праве перадача тэрыторыі адной дзяржавы другой па згодзе паміж імі. Ц. прадугледжвае адпаведную кампенсацыю, якая можа быць выяўлена ў рознай форме. Ц. патрабуе таксама заключэння паміж адпаведнымі дзяржавамі міжнар. дагавора, які будзе адпавядаць усім асн. прынцыпам сучаснага міжнар. права.

Э.І.Кузьмянкова.

ЦЭ́СЛЕР Уладзімір Якаўлевіч (н. 30.4.1951, г. Слуцк Мінскай вобл.), бел. мастак, дызайнер. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1980). Аўтар плакатаў «86 — міжнародны год міру» (1986), «Мой родны кут», «Маркс—87», «Нержавеючы Сталін» (усе 1987), «Беларусь — край фальклору» (1988), «Афганістан» (1991), «Чыз», «Забаронены плод» (абодва 1994), «Зроблена ў новай Расіі» (1996), жывапісных кампазіцый «Рыба», «Чарапаха», «Насарог», «Каравела «Санта Марыя», «Чынгісхан», «Кітайскі квартал» (усе пач. 1990-х г.), маст. афармлення кнігі «Колеразнаўства» Л.Міронавай (1984), серыі «Вынікі стагоддзя» (з 1994), ілюстрацый да кн. «Англійскія прыказкі і прымаўкі» С.Кускоўскай (1987), маст. акцыі «Праект стагоддзя: 12 з XX-га» (1996—2000) — усе з С.Войчанкам. Творы вылучаюцца глыбокай канцэптуальнасцю, філас. шматзначнасцю, сімвалічнай і метафарычнай мовай.

Літ.: Бембель Т. В.Цеслер и С.Войченко. М., 2003. *Л.В.Салавей.*

ЦЭСТАДО́ЗЫ, глісныя хваробы жывёл і чалавека, якія выклікаюцца *стужачнымі чарвякамі* (цэстодамі). Віды Ц. на Беларусі: *дыфілабатрыёзы, тэніідозы, цэнурозы, цыстыцэркозы, эхінакакоз* і інш. У палаваспелай стадыі ўзбуджальнікі паразітуюць у кішэчніку сабачых, кашэчых, куніцавых (канчатковыя гаспадары), у лічынкавай — у розных органах і тканках авечак, буйн. раг. жывёлы, свіней, ласёў і чалавека (прамежкавыя гаспадары). Пры Ц. пашкоджваюцца кішэчнік, печань, лёгкія, галаўны і спінны мозг, інш. органы. Прафілактыка: *дэгельмінтызацыя*, ветэрынарна-сан. кантроль мясных прадуктаў і інш.

І.М.Семяненя.

ЦЭСТО́ДЫ, клас плоскіх чарвей, гл. *Стужачныя чэрві.*

ЦЭТА́Н, гексадэкан, насычаны вуглевадарод нармальнай будовы $CH_3(CH_2)_{14}CH_3$.

Бясколерная вадкасць, $t_{пл}$ 18,2 °С, $t_{кіп}$ 286,8 °С, шчыльнасць 770 кг/м³ (пры 25 °С); не растваральнасць ў вадзе і спірце, растваральнасць ў бензоле, эфіры і інш. арган. растваральніках. Атрымліваюць Ц. награваннем актылбраміду з натрыем і інш. метадамі. Выкарыстоўваецца

У.Цэслер і С.Войчанка. Jazz tour. 1998.

як эталон для ацэнкі якасці дызельнага паліва (гл. *Цэтанавы лік*).

ЦЭТА́НАВЫ ЛІК, умоўная колькасная характарыстыка ўзгаральнасці дызельнага паліва ў рухавіках унутр. згарання. У якасці эталона выкарыстоўваецца сумесь *цэтану* і альфа-метылнафталіну, Ц.л. якіх прыняты за 100 і 0 адпаведна. Ц.л. дадзенага паліва роўны працэнтнай (па аб'ёме) колькасці цэтану ў такой сумесі, якая мае аднолькавую ўзгаральнасць з даследаваным палівам.

ЦЭ́ТКІН (Zetkin) Клара (5.7.1857, в. Відэраў, Германія — 20.6.1933), дзеяч герм. і міжнар. рабочага руху, адна з лідэраў міжнар. жаночага руху. Вучылася ў настаўніцкай навуч. установе (г. Лейпцыг, 1874—78). Чл. Герм. с.-д. партыі з 1881. З 1881 у эміграцыі ў Францыі, Аўстра-Венгрыі, Швейцарыі, Італіі, дзе ўдзельнічала ў с.-д. руху. Удзельніца заснавання *Інтэрнацыянала 2-га* (1889). Пасля вяртання на радзіму лідэр ням. жаночага сацыяліст. руху: у 1892—1917 кіравала выданнем с.-д. газ. ням. работніц «Die Gleichheit» («Роўнасць»), з 1907 сакратар Міжнар. жаночага сакратарыята, у 1910 ініцыіравала святкаванне *Міжнароднага жаночага дня 8 сакавіка*. У 1-ю сусв. вайну выступала з антываен. пазіцый, удзельнічала ў стварэнні леварадыкальнай «Групы Спартак» (1915—16, з ліст. 1918 «*Спартака саюз*»). З 1917 чл. Незалежнай с.-д. партыі Германіі, з 1919 Камуніст. партыі Германіі і яе ЦК. Дэп. герм. рэйхстага з 1920. З 1921 чл. Выканкома *Камуністычнага Інтэрнацыянала* (да 1924 узначальвала зах.-еўрап., потым міжнар. жаночы сакратарыят). З 1925 старшыня Выканкома *Міжнароднай арганізацыі дапамогі барацьбітам рэвалюцыі*. З 1920-х г. жыла пераважна ў СССР. У 1932 выступіла ў рэйхстагу з прамовай супраць фаш. пагрозы, за стварэнне адзінага антыфаш. фронту.

ЦЭТРА́РЫЯ (Cetraria), род лішайнікаў сям. пармеліевых. 15 відаў. Пашыраны ўсюды. На Беларусі 4 віды Ц.: верасовая (C.ericetorum), ісландская, або ісландскі мох (C.islandica), плотавая (C.sepincola), хларафілавая (C.chlorophylla). Трапляюцца на глебе, камянях, радзей на ствалах дрэў, сярод імхоў і інш. лішайнікаў.

Слаявіна ліставатая або кусцістая, выш. да 12 см, з выяўленым верхнім і ніжнім коравым слоем. Афарбоўка зверху белавата-шэрая, шаравата-зялёная, жоўтая да карычневай, ніжняя — ад светлай да цёмнай. Пладовыя целы (*апатэцыі*) сядзячыя або на кароткіх ножках, развіваюцца на канцах лопасцей. Споры аднаклетачныя, бясколерныя, па 8 у сумцы. З Ц. ісландскай атрымліваюць антыбіётыкі, яна ўваходзіць у склад ягелю (корм для паўн. аленяў). Лек., кармавыя расліны.

Н.М.Кобзар.

ЦЭ́ЎКА, у беларусаў ткацкая прылада ў выглядзе драўлянай палачкі, на якую накручвалі (насуквалі) уточную пражу. Даўж. 14—16 см, з патаўшчэннямі на канцах. Пры тканні ўстаўлялася ў чаўнок. Ніткі на Ц. навівалі пры дапамозе *сукала*.

ЦЭ́ЎКА, косць нагі птушак і некат. дыназаўраў, размешчаная паміж галёнкай і пальцамі. Утварылася ад зліцця 3-й пятачнай косці з плюснявымі касцямі як прыстасаванне да хаджэння на задніх канечнасцях. Найб. развіта ў балотных птушак. У самцоў некат. курыных на заднім баку Ц. ёсць рагавое ўтварэнне — шпора.

ЦЭФАЛАСПАРЫ́НЫ, прыродныя і паўсінт. *антыбіётыкі*. Маюць шырокі спектр дзеяння: актыўныя ў адносінах да *стафілакокаў, стрэптакокаў, пнеўмакокаў* і інш. мікраарганізмаў. Выкарыстоўваюць для лячэння пнеўманіі, сепсісу, менінгіту і інш. інфекц. захворванняў.

ЦЭФЕІ́ДЫ, фізічныя *пераменныя зоркі*, перыядычная змена бляску якіх абумоўлена пульсацыяй верхніх слаёў зоркі. Перыяд змены бляску ад 1 да 50 сут (часам да 200 сут). Назва ад тыповай Ц. — зоркі δ *Цэфея*.

ЦЭФЕ́Й (лац. Cepheus), каляпалярнае сузор'е Паўн. паўшар'я *зорнага неба*. Часткова размешчана ў *Млечным Шляху*. Найб. яркая зорка — Альдэрамін 2,4 візуальнай *зорнай велічыні*; 60 зорак ярчэй 6-й зорнай велічыні, δ Ц. — першая зорка, аднесеная да тыпу пераменных зорак — *цэфеід*; μ Ц. — «гранатавая» зорка — адна з самых халодных зорак (яе т-ра не перавышае 2000 К). У Ц. знаходзіцца крыніца рэнтгенаўскага выпрамянення Сер. X-1 — рэштка *звышновай зоркі*. З тэр. Беларусі відаць круглы год.

ЦЭХ (ням. Zeche), асноўнае падраздзяленне прадпрыемства, адасобленае ў адм. і вытв.-гасп. адносінах, якое займаецца вырабам, аказаннем паслуг, выкананнем стадый вытв. працэсу, гасп. функцый. Паводле ролі ў вытв. працэсе вылучаюць а с н о ў н ы я (выпускаюць прадукцыю, для вырабу якой прызначана прадпрыемства), д а п а м о ж н ы я (аказваюць паслугі інш. Ц. прадпрыемства), п а б о ч н ы я (вырабляюць прадукцыю з адходаў вытв-сці), п а д с о б н ы я (вырабляюць тару, цэглу і інш.), э к с п е р ы м е н т а л ь н ы я (вырабляюць доследныя ўзоры і розныя эксперым. работы).

ЦЭ́ХАВЫЯ ШКО́ЛЫ, пачатковыя агульнаадукацыйныя школы, якія існавалі ў сярэдневяковых гарадах Зах. Еўропы для сыноў рамеснікаў. Найб. пашыраны ў 13—14 ст. Адкрываліся па ініцыятыве *цэхаў* і ўтрымліваліся за іх кошт; за навучанне плацілі бацькі. Гал. ўвага ў іх аддавалася навучанню чытанню, пісьму і ліку, а таксама элементам геаметрыі і прыродазнаўства. Выкладанне ў Ц.ш. вялося на роднай мове. У 15—16 ст. яны аб'ядноўваліся з *гільдзейскімі школамі* і пераўтвараліся ў гар. (магістрацкія) школы, якія ўтрымліваліся гар. самакіраваннем.

ЦЭХАНО́ЎСКІ Цэлясцін Міхайлавіч (1835, в. Горлава Дрыбінскага р-на Магілёўскай вобл. — 10.1.1906 або 1907), адзін з кіраўнікоў *паўстання 1863—64*, урач. Скончыў Маскоўскі ун-т (1857). У час вучобы ўваходзіў у нелегальную студэнцкую арг-цыю «Огул». З 1857 працаваў урачом у Гродне. З 1861 у складзе Гродзенскай рэв.-дэмакр. арг-цыі, з вясны 1863 паўстанцкі грамадзянскі на-

Цэтрарыя ісландская.



Сузор'е **Цэфей**.

чальнік г. Гродна: вербаваў людзей у паўстанцкія атрады, набываў абмундзіраванне, распаўсюджваў газеты і пракламацыі. 30.7.1863 арыштаваны, прыгавораны да смяротнага пакарання, якое заменена 20 гадамі катаржных работ у Сібіры. Пакаранне адбываў на буд-ве Кругабайкальскага паштовага тракту. У 1866 тэрмін катаргі скарочаны напалову, Ц. пераведзены на Аляксандраўскі вінакурны з-д. У 1868 вызвалены ад катаргі і накіраваны на пасяленне ў Іркуцкую акругу. З 1872 урач Аляксандраўскага з-да, аказваў мед. дапамогу зняволеным. Пасля адбыцця пакарання ў 1883 на радзіму не вярнуўся. Быў чл. т-ва ўрачоў Зах. Сібіры.

Літ.: Ігнатовіч Ф. Целясцін Цэханоўскі // Праз смугу стагоддзяў. Мн., 1993.

Ф.І.Ігнатовіч.

ЦЭ́ХІ (ад ням. Zeche знак), аб'яднанні рамеснікаў адной ці некалькіх блізкіх прафесій у феад. гарадах. Найб. пашыраны былі ў гарадах Зах. Еўропы ў 13—15 ст. Манапалізавалі вытв-сць і збыт прадукцыі, абаранялі рамеснікаў ад самаўладдзя феадалаў і канкурэнцыі інш. рамеснікаў ва ўмовах вузкага ўнутр. рынку. Унутр. дзейнасць Ц. вызначалася статутамі (зацвярджалі манархі краін, а ў прыватнаўласніцкіх гарадах — іх уладальнікі), якія рэгламентавалі вытв-сць і збыт прадукцыі, якасць сыравіны і гатовых вырабаў, тэхналогію вытв. працэсу, час і ўмовы работы, арганізацыю навучання і інш. Ц. кантралявалі паводзіны сваіх членаў, наладжвалі ўзаемадапамогу. На Беларусі першыя Ц. ўзніклі ў 15 ст. з наданнем гарадам *магдэбургскага права* (ім папярэднічалі рамесніцкія брацтвы без пісьмовых статутаў), пашырыліся ў 16 ст. Яны развіваліся на зах.-еўрап. ўзор, але мелі асаблівасці: спалучалі традыц. нормы рамесных брацтваў з магдэбургскім правам; пераважалі Ц. з работнікаў некалькіх спецыяльнасцей; характарызаваліся канфесіянальнай памяркоўнасцю. На чале Ц. стаялі цэхмістры (старасты), якіх выбіралі штогод; паўнапраўнымі членамі Ц. былі майстры, ім падпарадкоўваліся падмайстры, чаляднікі («таварышы»), вучні («хлопцы»). У некат. Ц. выбіраліся дапаможныя службовыя асобы — ключнікі, сталовыя, шафары, пісары, інстыгатары. Цэхавыя рамеснікі падлягалі юрысдыкцыі *магістрата* і феадалаў. Ц. ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці горада, выконвалі вайск. і інш. павіннасці на карысць дзяржавы ці ўладальніка горада. Для разбору выпадкаў парушэння цэхавых статутаў, цяжбаў і прэтэнзій паміж майстрамі склікаліся спец. сходкі Ц. Права суд. разбору і вызначэння меры пакарання належала цэхмістрам (часам са старэйшымі майстрамі). Рашэнне цэхавага суда мела права адмяніць гар. рада. У 2-й пал. 18 ст. Ц. ў дзярж. гарадах падначалены «камісіям добрага парадку».

Пасля далучэння Беларусі да Рас. імперыі бел. Ц. прыведзены ў адпаведнасць з цэхавай арг-цыяй, уведзенай Пятром I у 1721—22 на ўзор зах.-еўрап. рамесных аб'яднанняў і канчаткова вызначанай *Даравальнай граматай* гарадам 1785, якая патрабавала пагалоўнага запісу рамеснікаў у Ц.; у 1799 прыняты дзярж. «Статут цэхаў». Ц. былі падначалены рамесным управам, якія прымалі і выключалі рамеснікаў са складу Ц., збіралі падаткі, рэгулявалі вытв. дзейнасць. Рамеснікі падзяляліся на вечна-цэхавых (запісваліся ў Ц. «навечна» і карысталіся правамі *мяшчан*) і часова-цэхавых. Закон 1852 спрасціў кіраванне Ц., скасаваў цэхавыя арг-цыі ў невял. гарадах і мястэчках, увёў асобны цэхавы стан, адрозны ад мяшчанскага. У 1-й пал. 19 ст. колькасць цэхавых рамеснікаў расла (у 1830-я г. ў Мінску 455 майстроў, 100 падмайстраў, 187 вучняў) і значна перавышала колькасць пазацэхавых рамеснікаў, але з 2-й пал. 19 ст. пачала зніжацца. Цэхавая вытв-сць сустракала ўсё большую канкурэнцыю з боку прадпрыемстваў капіталіст. прам-сці. Цэхавая арг-цыя існавала ў Расіі да 1917, у Зах. Беларусі — да 1930-х г.

Літ.: Копысский З.Ю. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в. Мн., 1975; Лютый А.М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII — первой половине XIX в. Мн., 1987.

ЦЭХІ́Н (італьян. zecchino ад zecca манетны двор), залатая манета Венецыі. Упершыню выпушчаны ў 1284, пазней вядомы як *дукат*.

ЦЭЦ, гл. *Цеплаэлектрацэнтраль*.

ЦЭЦЭ́, ц э - ц э (Glossina), род насякомых сям. сапраўдных мух атр. двухкрылых. Каля 20 відаў. Пашыраны ў вільготных мясцовасцях, пераважна ў лясах трапічнай і субтрапічнай Афрыкі.

Цэцэ.

Найб. вядомыя G. palpalis, G. morsitans, G. brevipalpis — пераносчыкі *трыпанасом* — узбуджальнікаў *сонная хвароба* чалавека і жывёлы; G. morsitans і G. tachinoides — пераносчыкі ўзбуджальнікаў хвароб свойскай жывёлы.

Даўж. 9—14 мм. Характэрны доўгія і шырокія сківічныя шчупальцы і доўгі колючы хабаток. Жывародныя. Кормяцца кроўю чалавека і пазваночных жывёл. *С.Л.Максімава.*

ЦЮ́БІНГ (англ. tubing ад tube труба), элемент зборнай канструкцыі (пераважна цыліндрычнай), што ўтварае і ўмацоўвае ўнутр. паверхню падземных вырабатак. Звычайна мае выгляд рабрыстага сегмента (жалезабетоннага, чыгуннага, стальнога або з вугальнай пластмасы), выгнутага адпаведна профілю вырабаткі. Адрозніваюць Ц. з бартамі (для балтовага злучэння іх паміж сабой) і без бартоў; прамежкі ў стыках запаўняюць расшыральным *цэментам*, свінцом ці метал. замазкай. Выкарыстоўваюць пры стварэнні *шахтавых ствалоў* і *тунэляў*.

Чыгунны цюбінг.

ЦЮБІНГЕ́НСКАЯ ШКО́ЛА, 1) кірунак у нямецкай пратэстанцкай тэалогіі, які развіваўся ва ун-це г. Цюбінген. Першы перыяд у яе гісторыі (1777—97), звязаны з дзейнасцю К.Г.Штора, І.Ф.Флата і інш., быў накіраваны супраць *рацыяналізму*. У 1830 узнікла т.зв. новая Ц.ш. (Ф.К.Баўр, Э.Цэлер, А.Швеглер і інш.), асн. задача якой заключалася ў выкарыстанні метадаў гіст. навукі для даследавання гісторыі хрысціянства і яго помнікаў. Прадстаўнікі гэтага кірунку ўпершыню зрабілі дэталёвы аналіз асн. стараж. помнікаў хрысц. л-ры, у першую чаргу — Евангелляў, Новага запавету і інш.; яны імкнуліся вызваліць літ. крыніцы ранняга хрысціянства ад шматлікіх скажэнняў, выявілі некат. супярэчнасці паміж Евангеллямі і недакладнасць царк.-кананічнай храналогіі, удакладнілі гіст. даты Евангелляў. 2) Кірунак у нямецкай каталіцкай тэалогіі, які развіваўся ва ун-це г. Цюбінген. Яго прадстаўнікі (І.А.Мёлер. І.Кун, К.І.Гефеле і інш.) распрацавалі ідэалогію старакаталіцкай царквы, якая ўтварылася пасля 1-га Ватыканскага сабора (1869—70) і не прызнавала вярх. улады папы рымскага над царквой. *І.В.Катляроў.*

ЦЮ́ДАР, Цюдор (Tudor) Энтані [сапр. Кук (Cooke) Уільям; 4.4.1908, Лондан — 19.4.1987], англійскі артыст балета, балетмайстар. Вучань М.*Рамбер*. З 1930 працаваў у трупах «Бале Рамбер», «Вік-Уэлс бале», «Лондан бале» (адзін з заснавальнікаў), «Амерыкан бале тыэтр» (адзін з кіраўнікоў), Каралеўскім швед. балеце і інш. Заснавальнік т.зв. псіхал. балета, у якім побач з класічным танцам выкарыстаў сродкі танца мадэрн. Сярод пастановак: «Бэзавы сад» на муз. Э.Шасона (1936; адначасова выканаў партыю Мужчыны ў яе мінулым), «Змрочныя элегіі» на муз. Г.Малера (1937), «Вогненны слуп» на муз. А.Шонберга (1942), «Рамэо і

Джульета» на муз. Ф.Дыліуса (1943), «Вандруючы рыцар» на муз. Р.Штрауса (1968), «Лісце вяне» на муз. А.Дворжака (1975) і інш. *І.Л.Чэбан.*

ЦЮ́ДАРЫ (Tudor), каралеўская дынастыя ў Англіі [1485—1603]. Змяніла на троне дынастыю *Йоркаў*. Заснавальнік — Генрых VII Ц., кароль [1485—1509], паходзіў па бацьку з уэльскіх феадалаў, па маці — родзіч *Ланкастэраў*. Інш. прадстаўнікі: Генрых VIII [1509—47], Эдуард VI [1547—53], *Марыя Цюдар* [1553—58] і *Лізавета I* [1558—1603]. Занялі трон у выніку *Пунсовай і Белай ружы вайны*. Ц. паклалі пачатак англ. *абсалютызму*, які дасягнуў росквіту пры Генрыху VIII. Пры Ц. праведзена *Рэфармацыя*, у ходзе якой узнікла *англіканская царква*, царк. ўласнасць ператворана ў свецкую, што ўмацавала каралеўскую казну і ўладу; адбываўся эканам. ўздым краіны, хутка раслі мануфактуры; узніклі буйныя гандл. кампаніі, у т.л. Ост-Індская; вялася паспяховая вайна супраць Іспаніі за кантроль над гандл. шляхамі ў Атлантычным акіяне. Пасля разгрому ісп. *«Непераможнай армады»* ў 1588 Англія стала найбуйнейшай марской дзяржавай. Усталяваны гандл. сувязі з Рас. дзяржавай (1553). Пасля смерці Лізаветы I (1603) трон перайшоў да *Сцюартаў*.

Літ.: Гриффитс Р.А., Томас Р. Становление династии Тюдоров: Пер. с англ. Ростов н/Д, 1997.

ЦЮЛЬРЫ́, Цюльеры (Tuileries), адна з рэзідэнцый франц. каралёў у Парыжы, узведзеная як ч. комплексу *Луўра*. Буд-ва пачалося ў 1564 паводле загаду Кацярыны Медычы; шмат разоў перабудоўваўся. У сувязі з франц. рэвалюцыяй 1789—99 Людовік XVI у 1789 перанёс рэзідэнцыю з Версаля ў Ц. 10.8.1792 парыжане занялі палац і скінулі манархію. У 1792—99 тут засядаў *Канвент*. Ц. быў афіц. рэзідэнцыяй Напалеона I. У час рэвалюцыі 1848 у Францыі ўзяты штурмам (24 лют.). 24.5.1871 большая ч. Ц. згарэла ў час баёў парыжскіх камунараў з версальцамі. У 1882 Ц. поўнасцю знесены; на яго месцы засн. адзін з самых прыгожых садоў Парыжа.

ЦЮЙ ЮА́НЬ (каля 340 — каля 278 да н.э.), першы вядомы кітайскі паэт. Адзін з вышэйшых саноўнікаў царства Чу, удзельнічаў у падрыхтоўцы дзярж. указаў, уплываў на знешнюю палітыку двара. За прагрэс. погляды зазнаў ганенні, жыў у выгнанні. Збераглося каля 25 яго паэт. твораў, у т.л. паэма-элегія «Лісао» («Слёзы адлучанага»), напісаных пад уплывам нар. паэзіі, звязаных з кіт. паданнямі і вераваннямі. Стварыў паэт. жанр чуцы — адзін з асн. у кіт. класічнай л-ры. З яго творчасцю звязаны пераход ад фалькл. традыцыі да аўтарскай.

Тв.: Рус. пер. — Стихи. М., 1956.

ЦЮЛЕ́НІ, водныя млекакормячыя атр. ластаногіх. 2 сям.: вушастыя Ц. (Otariidae) — 7 родаў, 14 відаў, найб. вядомыя з іх *марскія коцікі, марскія львы, сівучы* і сапраўдныя, ці бязвухія, Ц., або цюленевыя (Phocidae) — 13 родаў, 18 відаў, найб. вядомыя з іх *лахтак*, ці марскі заяц, *марскія слоны, нерпы*, грэнландскія Ц., ці лысуны, Ц.-манахі, хахлачы. Пашыраны пераважна ў морах халоднага і ўмеранага паясоў і інш. У Чырв. кнізе МСАП 6 відаў і 1 падвід.

Даўж. 1,2—6,5 м, маса ад 40 кг да 3,5 т, самкі драбнейшыя. Цела верацёнападобнае, шыя невыразная. Парныя канечнасці — ласты, пальцы рэдукаваныя. У сапр. Ц. няма вонкавай вушной ракавіны (адсюль другая назва), ласты з поўсцю і кіпцюрамі, заднія выцягнуты назад і не падтрымліваюць тулава на сушы. Вушастыя Ц. маюць рудыментарныя вушныя ракавіны, ласты амаль без валасянога покрыва. Кіпцюроў на пярэдніх ластах няма, заднія падгінаюцца ўперад для перамяшчэння па сушы. Нараджаюць 1 дзіцяня. Кормяцца рыбай, малюскамі і інш. Аб'екты абмежаванага промыслу. *Э.Р.Самусенка.*

Цюлені: 1 — даўгаморды; 2 — звычайны; 3 — лысун; 4 — крылатка; 5 — манах; 6 — хахлач.

ЦЮЛЬГА́ Аляксей Мікалаевіч (12.5.1922, в. Клясін Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл. — 18.11.1953), Герой Сав. Саюза (1944). У Вял. Айч. вайну з 1942

А.М.Цюльга.

партызан атрада імя Калініна, партыз. брыгады 1-й Гомельскай. З 1943 на Бел. і 1-м Укр. франтах, разведчык. Вызначыўся пры вызваленні Польшчы. 29.7.1944 з 2 разведчыкамі пераправіўся цераз Віслу ў раёне г. Юзэфаў і разведаў лінію абароны праціўніка. У баі за плацдарм на чале групы разведчыкаў знішчыў 15 гітлераўцаў. У раёне мяст. Кіселін захапіў 2 «языкоў». Пасля вайны працаваў на электрахімкамбінаце. З 1949 у Сав. Арміі.

ЦЮ́ЛЬКІ (Clupeonella), род рыб сям. *селядцовых*. 4 віды. Пашыраны ў Азоўскім, Каспійскім, Чорным морах і іх басейнах. Найб. вядомая Ц. чарнаморска-азоўская, або каспійская кілька (C.cultriventris).

Даўж. да 15 см, маса да 9 г. Спіна і верхняя ч. галавы шэра- або сіне-зялёныя, бруха белае ці залаціста-жоўтае. Ад горла да анальнай адтуліны цягнецца «кіль» з шыпаватых лускавінак. Характэрны 2 падоўжныя прамяні на канцы анальнага плаўніка. Чародныя. Кормяцца пераважна зоапланктонам. Аб'екты промыслу. Гл. таксама *Кількі*.

ЦЮЛЬПА́Н (Tulipa), род кветкавых раслін сям. лілейных. Каля 100 (паводле інш. звестак 140) відаў. Пашыраны ва ўмераным поясе Еўразіі. У культуру ўведзены ў Турцыі (16 ст.), прамысл. вырошчванне найб. развіта ў Нідэрландах. Існуе больш за 4 тыс. сартоў. На Беларусі 1 від — Ц. лясны (T.sylvestris), занесены ў Чырв. кнігу. Трапляецца ў дубровах, па берагах рэк і азёр. Інтрадукавана каля 30 відаў Ц.: Грэйга (T.greigii), Каўфмана (T.kaufmanniana), позні (T.tarda), Увядзенскага (T.vvedenskyi), Фостэра (T.fosteriana) і інш.

Шматгадовыя травяністыя цыбульныя расліны выш. 6—50 см. Развіваюцца на працягу кароткага вясенняга перыяду (*эфемероіды*). Сцябло прамастойнае. Лісце (2—5) сядзячае, шырокаавальнае або ланцэтнае, голае ці апу-

1

2

3

4

Цюльпан: 1 — лясны; сарты: 2 — Голдэн Апельдорн; 3 — Тэхас Флэйм; 4 — Гордан Купер.

шанае. Кветкі адзіночныя, радзей у простым суквецці, яркія, рознакаляровыя. Плод — каробачка. Дэкар. расліны.

ЦЮЛЬПА́НАВАЕ ДРЭ́ВА, лірыядэндран (Liriodendron), род кветкавых раслін сям. магноліевых. 2 віды з разарваным арэалам, характэрным для стараж. груп кветкавых раслін: Ц.д. амерыканскае (L.tulipifera) з Паўн. Амерыкі і кітайскае (L.chinense), расце ў Кітаі і на Пн Індакітая. У выкапнёвым стане вядомыя з верхняга мелу. На Беларусі інтрадукавана ў паўд. і паўд.-зах. раёнах Ц.д. амерыканскае. Трапляецца рэдка.

Ц.д. амерыканскае — лістападная расліна выш. 50—60 м (ва ўмовах Беларусі каля 18 м). Ствол дыям. да 3,5 м. Крона яйцападобная. Лісце ліравападобнае, лопасцевае, бліскучае, даўж. 12—15 см. Кветкі адзіночныя, на канцах галін, буйныя (дыям. каля 6 см), зеленавата-белыя, нагадваюць кветкі цюльпанаў (адсюль назва). Плод арэшкападобны. Драўніна прыдатная для вырабу мэблі, муз. інструментаў. Дэкар. расліна.

Цюльпанавае дрэва амерыканскае.

ЦЮМЕ́НЕЎ Аляксандр Ільіч (24.8.1880, С.-Пецярбург — 1.6.1959), савецкі гісторык. Акад. АН СССР (1932). Скончыў Пецярб. ун-т (1904), працаваў у ім (1921—23), у Ленінградскім аддзяленні Камуніст. акадэміі (1928—31), Ін-це гісторыі матэрыяльнай культуры АН СССР (1931—38). Даследаваў гісторыю стараж.-усх. і ант. дзяржаў, у т.л. пытанні рабства, гандлю, паліт. жыцця, помнікі стараж.-грэч. пісьма, а таксама метадалогію і сацыялогію гісторыі.

Тв.: Государственное хозяйство древнего Шумера. М.; Л., 1956.

Літ.: Амусин И.Д. Академик А.И. Тюменев — историк древнего мира // Вестн. древней истории. 1974. № 3.

ЦЮМЕ́НСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ. Размешчана ў Зах. Сібіры, у Рас. Федэрацыі. Утворана 14.8.1944. Пл. 1435,2 тыс. км^2. Нас. 3272,2 тыс. чал. (2002), гарадскога 77%. Цэнтр — г. *Цюмень*. Буйныя гарады: Сургут, Ніжнявартаўск, Нефцеюганск, Табольск, Новы Урэнгой, Нягань, Ішым. У складзе вобласці *Ханты-Мансійская аўтаномная акруга* і *Ямала-Ненецкая аўтаномная акруга*.

Тэр. вобласці ў межах Зах.-Сіб. раўніны. Пераважае плоскі рэльеф. Самыя нізкія ўчасткі (50—100 м) у цэнтр. ч. (Кондзінская і Сярэдняобская нізіны) і на Пн (Ніжняобская, Надымская, Тазаўская нізіны). На З — усх. схілы Паўн., Прыпалярнага і Палярнага Урала, на У — Ніжнеенісейскае і Верхнятазаўскае ўзв., ва ўнутр. ч. — Сібірскія Увалы. Карысныя выкапні: нафта і газ (адпаведна 64% і 91% запасаў Расіі; Зах.-Сіб. нафтагазавая правінцыя), буры вугаль, жал. і хромавыя руды, марганец. фасфарыты, золата, барыт, буд. матэрыялы. Клімат кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад -17 да -29 °С, ліп. ад 4 да 18 °С. Ападкаў 220—600 мм за год. На Пн пашырана шматгадовая мерзлата. Гал. рака Об з Іртышом; Надым, Пур, Таз. Шмат азёр. Глебы пераважна падзолістыя і тарфяна-балотныя, на Пн тундравыя, на Пд чарназёмна-лугавыя, па далінах рэк алювіяльныя. Большую ч. лясоў вобласці складае тайга (хвоя, піхта, кедр, елка, лістоўніца). На Пн расліннасць тундравая і лесатундравая, на Пд лесастэпавая. Пад лесам 21% тэр. Вял. плошчы забалочаных і саланчакових лугоў. Запаведнікі: Верхнятазаўскі, Малая Сосьва, Юганскі.

Гал. галіна прам-сці — нафтагазаздабыўная. На долю Ц.в. прыпадае 66% здабычы нафты (198 млн. т, 1998) і 92% здабычы газу (542 млрд. м^3) Расіі. Асн. цэнтры нафтаздабычы — Сургут, Ніжнявартаўск, Нефцеюганск, Урай, газаздабычы — Надым, Урэнгой, Новы

ЦЮМЕНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ
Маштаб 1:13 000 000
Пермская вобл.
Тюменская вобл.
Ямал
Гыданский п-аў
Ямальская града
Таймырская
(Даугана-Ненецкая)
аут. акругa
Ненецкая аут. акруга
Ханты-Мансійская аут. акруга
Ямала-Ненецкая аут. акруга
Ханты-Мансійск
Нефцеюганск
Ніжнявартаўск
Сургут
Нягань
Югарск
Радужны
Пакачы
Лянтор
Мегіён
Лангепас
Кагалым
Мураўленка
Наябрск
Губкінскі
Новы Урэнгой
Урэнгой
Краснасельскуп
Самбург
Тазаўскі
Новы Порт
Ямбург
Ныда
Надым
Пангоды
Тарка-Сале
Ванзеват
Бярозава
Сосьва
Ігрым
Белаярскі
Мужы
Горнкі
Лабытнангі
Салехард
Воркута
Інта
Усінск
Ярцево
Смаленск
Вязьма
Гагарын
Рудня
Дарогабуж
Ельня
Рослаў
Смаленскае ўзв.
Верхнятагільскае ўзв.
Сярэднясібірскае пласкагор'е
Ніжнятунгускае пласкагор'е
Ціманскі хр.
Паўночны Урал
Прыпалярны Урал
Сярэдняя Сібір
Ціманскі
Сярэднясібірская
Ніжнятунгускае

касць гравюр (геагр. карты, партрэты гіст. асоб, сцэны значных паліт. падзей, віды гарадоў, алегорыі на матывах міфалагічных і біблейскіх сюжэтаў, гербы, экслібрысы і інш.). У 1567—68 з малюнка І.Адэльгаўзера выканаў гравюру, якая ілюструе прыём у Гродне Жыгімонтам II Аўгустам паслоў Івана IV (т.зв. гравюра Гродна). Гравюра (памеры 103 х 35,3 см) мае панарамную выяву забудовы аднаго з найбуйнейшых бел. гарадоў сярэдзіны 16 ст., адлюстроўвае некат. дэталі гар. побыту. У 17—18 ст. з яе неаднаразова рабілі паўторы (менш падрабязныя ў параўнанні з арыгіналам). *Р.В.Баравы, А.А.Трусаў.*

ЦЮ́ПА Вячаслаў Алегавіч (н. 10.1.1955, Душанбе), расійскі і бел. рэжысёр. Вучыўся ў Мінскім муз. вучылішчы імя М.Глінкі (1969—71), скончыў Муз. вучылішча імя Гнесіных (1976), Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва ў Маскве (1981). З 1981 рэжысёр-пастаноўшчык Растоўскага т-ра муз. камедыі. З 1984 в.а. гал. рэжысёра, з 1987 гал. рэжысёр Дзярж. т-ра муз. камедыі Беларусі, у 1992—98 рэжысёр-пастаноўшчык Нац. акад. т-ра оперы Беларусі. Яго работы вызначаюцца рэжысёрскай фантазіяй, паэтычна-рамант. светаадчуваннем, пошукам новых выразных сродкаў. У т-ры муз. камедыі паставіў «Сірано» С.Пажлакова (1984), «Гуляем у прынца і жабрака» А.Журбіна, «Сільва» І.Кальмана (абедзве 1986), «Клоп» У.Дашкевіча (1988), «Хэло, Долі!» Дж.Германа (1992), «Халопка» М.Стрэльнікава (1994), «Чараўнік» Д.Рансуінка (1992, дзіцячы муз. т-р «Казка»); у Нац. акад. т-ры оперы Беларусі «Дзікае паляванне караля Стаха» У.Солтана (1989, Дзярж. прэмія Беларусі 1990), «Апалон-заканадаўца, або Рэфармаваны Парнас» Р.Вардоцкага (1989, канцэртная версія), «Кармэн» Ж.Бізэ (1990), «Майстар і Маргарыта» Я.Глебава (1992), «Іаланта» П.Чайкоўскага (1993), «Сельскі гонар» П.Масканьі (1996). З 1998 працуе ў Расіі.

Літ.: Брылон В. Слава для мяне не самамэта // Мастацтва Беларусі. 1991. № 8.
В.Г.Брылон.

ЦЮРГО́ (Turgot) Ан Рабер Жак (10.5.1727, Парыж — 20.3.1781), французскі дзярж. дзеяч, філосаф, эканаміст. Скончыў тэалагічны ф-т Сарбоны, але адмовіўся ад духоўнай кар'еры. У 1761—74 інтэндант у Ліможы. У 1774—76 ген. кантралёр фінансаў (міністр фінансаў, гандлю і грамадскіх работ); ажыццявіў шэраг рэформ, якія лібералізавалі эканам. жыццё Францыі (выдаў дэкрэт пра свабодны гандаль хлебам, у 1766 скасаваў дарожныя павіннасці і цэхавую арганізацыю). У працы «Размова пра ўсеагульную гісторыю» (1750) распрацаваў філасофію гісторыі, у цэнтры якой аналіз прагрэсу ў розных галінах грамадскага жыцця і законаў, якія імі кіруюць. Гэтыя ідэі Ц. развіты ў працах М.Ж.Кандарсэ і К.А.Сен-Сімона. У эканам. тэорыі Ц. за аснову ўзяў канцэпцыю *фізіякратаў* чыстага с.-г. прадукту і фізіякратычны падзел на класы. Адмаўляў ідэю натуральнага парадку і стаяў на пазіцыях асабістага інтарэсу, з якога выводзіў пастулат свабоднай канкурэнцыі; прадказаў ідэю гарманізуючай дзейнасці рынку А.Сміта. Зрабіў пэўны ўклад у развіццё тэорыі грошай. Асн. яго праца «Роздумы пра стварэнне і размеркаванне багацця́ў» (1766). Аўтар артыкулаў у «Энцыклапедыі» Д.Дзідро і Ж.Л.Д'Аламбера.

Тв.: Рус. пер. — Избранные философские произведения. М., 1937; Избранные экономические произведения. М., 1961.
Н.К.Мазоўка.

ЦЮРКАЛО́ГІЯ, сукупнасць гуманітарных навук, што вывучаюць мовы, этнаграфію, гісторыю, л-ру, фальклор, культуру народаў, якія гавораць на *цюркскіх мовах*. Зарадзілася ў 15—16 ст. з натуральнай цікавасці еўрапейцаў да тур. заваёўнікаў, таму напачатку яе асн. кірункам было вывучэнне Асманскай імперыі і тур. мовы. Сістэм. даследаванні ў Зах. Еўропе пачаў аўстр. ўсходазнавец і дыпламат І.Гамер-Пургшталь (1774—1856), у Расіі (з 2-й пал. 18 ст.) — І.Гіганаў і С.Хальфін.

Рас. Ц. ў 19 — пач. 20 ст. развівалася комплексна: вывучэнне мовы, л-ры, гіст. помнікаў, нумізматыкі (працы М.М.Казем-бека, Ф.Я.Корша, В.В.*Радлава* і інш.). У сав. перыяд у галіне Ц. працавалі В.У.Бартальд, Я.Э.Бертольс, У.А.Гардлеўскі, Т.Г.Кезма, М.Я.*Мар*, І.А.*Арбелі* і інш.; з 1970-х г. Ц. засяроджана ў Ін-це ўсходазнаўства АН СССР (з 1991 — Рас. АН). Сярод даследчыкаў зах. краін пытанні Ц. вывучалі Х.Боўэн, Б.Льюіс (Вялікабрытанія), Ф.Бабінгер, Г.Яшке (Германія), Ж.Дэні, М.Мала (Францыя), Дж.В.Беркер, Р.Х.Дэвісан (ЗША) і інш.

На Беларусі цюркалагічныя даследаванні традыцыйна засяроджаны на вывучэнні гісторыі і культуры бел. *татараў* (працы Л.К.Крычынскага, А.В.*Мухлінскага*, Дж.Александровіча, А.І.Дубінскага, С.У.Думіна, І.Б.Канапацкага, А.І.*Смоліка*, А.П.*Грыцкевіча*, В.І.Несцяровіча, Я.А.Якубоўскага і інш.).

ЦЮРКІ́ЗМ, слова, запазычанае з *цюркскіх моў*.

Частка лексічных сродкаў цюркскага паходжання захавалася ў бел. мове ад стараж.-рус. эпохі: «арда», «атаман», «баскак», «басурман», «бісер», «ярлык». Большасць Ц. запазычана ў перыяд самаст. развіцця старабел. мовы (14—17 ст.) у выніку гандл., дыпламат. і інш. кантактаў бел. насельніцтва з цюркскімі народамі (у асн. з татарамі, якія перасяляліся на Беларусь пераважна з Крыма) і праз пасрэдніцтва суседніх моў — рус., укр. і польскай. З 15—17 ст. у бел. мове ўжываюцца Ц. быт. характару: «аршын», «атлас», «барсук», «барыш», «буланы», «бурка», «казак», «капшук», «караван», «каўпак», «кафтан», «кілім», «кішэнь», «кумыс», «кутас», «магарыч», «мячэць», «нагайка», «саф'ян», «султан», «тафта», «харч», «чапрак», «шаравары» і інш. Слоўнікі бел. мовы фіксуюць шэраг устарэлых Ц.: «апанча», «армяк», «казна», «камка», «кісцень», «таф'я». Некаторыя Ц. перайшлі ў разрад *гістарызмаў*: «бунчук», «есаул», «калчан», «ківер», «мурза», «сагайдак», «тамга», «янычар», «ясыр». У сучасную бел. мову Ц. запазычваюцца праз рус. мову. Гэта пераважна экзатызмы (гл. *Экзатычная лексіка*): «акын», «бархан», «басмач», «гюрза», «калым», «кізіл», «кішлак», «кунак», «саксаул».

Літ.: Булыка А.М. Лексічныя запазычанні ў беларускай мове XIV—XVIII стст. Мн., 1980.
А.М.Булыка.

ЦЮ́РКСКІ КАГАНА́Т, дзяржава племяннога саюза цюркаў у 552—745 на тэр. Цэнтр. і Сярэдняй Азіі, Паўн. Кітая. На чале дзяржавы стаяў *каган*. У 545 цюркі разгромілі уйгурскія плямёны, у 551 — жужан. У 555 пад уладай цюркаў былі ўсе народы Цэнтр. Азіі, у т.л. кідані ў Зах. Маньчжурыі і енісейскія кіргізы. У 560-я г. яны перамаглі Эфталітаў дзяржаву, у 570-я г. ў залежнасць ад Ц.к. трапілі паўн.-кіт. дзяржавы Чжоў і Цы. У саюзе з Візантыяй Ц.к. пачаў вайну супраць Ірана за кантроль над *Вялікім шаўковым шляхам*; у 571 мяжа паміж імі праходзіла па р. Амудар'я, а ў 588—589 да Ц.к. далучаны і некаторыя вобласці на зах. беразе Амудар'і. У 576 цюркі захапілі Баспор (Керч), у 581 узялі ў аблогу Херсанес Таўрычаскі. У канцы 6 ст. з-за міжусобіц і паліт. крызісу Ц.к. распаўся на ўсх. (цэнтр.-азіяцкую) і зах. (сярэднеазіяцкую) часткі. Асн. землі Зах. Ц.к. ў 658—659 акупіраваны кіт. войскамі. У 704 Зах. Ц.к. вызваліўся ад кіт. залежнасці, але напады суседзяў і ўнутр. супярэчнасці прывялі яго да гібелі ў 740. Усх. Ц.к. у 609—619 аднавіў свой уплыў у Цэнтр. Азіі, але пасля паражэння ў 630 у вайне трапіў у залежнасць ад Кітая. У 691—716 на кароткі час ён пашырыў сваю тэр. ад Маньчжурыі да Сырдар'і; цюркскія атрады дайшлі да Самарканда. У 712—713 ён пацярпеў паражэнне ў бітвах з арабамі. Усх. Ц.к. распаўся на ўдзельныя княствы, а на яго месцы ўзнік Уйгурскі каганат (745—840).

ЦЮ́РКСКІЯ МО́ВЫ, група роднасных моў, пашыраных у Азіі і Усх. Еўропе. Разам з *тунгуса-маньчжурскімі мовамі* і *мангольскімі мовамі* ўтвараюць сям'ю *алтайскіх моў*. Паводле генеалагічнай класіфікацыі вылучаюць 6 груп. 4 групы належаць да заходнегунскай галіны: булгарская (мёртвыя — булгарская і хазарская мовы, жывая *чувашская мова*), агузская (мёртвая печанежская, жывыя — *турэцкая мова*, *азербайджанская мова*, *туркменская мова*, гагаузская і інш.), кыпчакская (мёртвыя — палавецкая, мова бел. татар, жывыя — *татарская мова*, *башкірская мова*, *казахская мова*, караімская, кумыкская, карачаева-балкарская, нагайская, каракалпакская і інш.), карлукская (мёртвая чагатайская, жывыя — *узбекская мова*, *уйгурская мова* і інш.). 2 групы належаць да ўсх.-гунскай галіны: уйгураагузская (мёртвая стараж.-уйгурская, жывыя — *якуцкая мова*, тувінская, хакаская і інш.), кіргізска-кыпчакская (мёртвая стараж.-кіргізская, жывыя — *кіргізская мова*, алтайская). Ц.м. уласцівы: у фанетыцы — сінгарманізм, трохсастаўны склад (зычны — галосны — зычны), багатая сістэма зычных; у марфалогіі — прыметнік марфалагічна ма-

ла адрозніваецца ад назоўніка і прыслоўя, няма грамат. роду, 2 грамат. лікі; у сінтаксісе — ізафет (спалучэнне 2 назоўнікаў без марфал. афіксаў, з якіх 1-ы з'яўляецца азначэннем 2-га); у лексіцы — шмат запазычанняў з манг., іранскіх, араб., сучасных еўрап. моў. Стараж. Ц.м. выкарыстоўвалі архонаенісейскае, стараж.-уйгурскае, араб. пісьмо. У бел. мове каля 2 тыс. *цюркізмаў*. Алфавіты на рус., лац., араб. асновах.

Літ.: Введение в изучение тюркских языков. М., 1969; Сравнительно-историческая грамматика тюркских языков: Фонетика. М., 1984; Сравнительно-историческая грамматика тюркских языков: Морфология. М., 1988; Сравнительно-историческая грамматика тюркских языков: Лексика. 2 изд. М., 2001. *А.Я.Супрун.*

ЦЮРЛІ́, вёска ў Маладзечанскім р-не Мінскай вобл., на аўтадарозе Маладзечна—Валожын. Цэнтр сельсавета і сумеснага вытв. кааператыва. За 3 км на ПдЗ ад горада і чыг. ст. Маладзечна, 76 км ад Мінска. 794 ж., 277 двароў (2003). Пач. школа-сад, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЦЮ́РЫН Вячаслаў Пятровіч (н. 5.9.1939, пас. Пугачова Арэнбургскага р-на, Расія), бел. мастак. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1965). З 1967 выкладаў у Бел. АМ, з 2002 у Міжнар. гуманіт. ін-це пры БДУ. Працуе ў розных жанрах станковага жывапісу, графіцы. Сярод твораў: «Дэпо» (1966), «Перад дарогай» (1967), «Змярканне» (1969), «Лукомская ДРЭС» (1971), «Над Прыпяццю» (1977), «Будслаўскія музыкі» (1984), «Гандляр птушкамі» (1990), «Празрыстая восень» (1992), «Блакітныя сны» (1995), «Птушкі вярнуліся зноў» (1998), «Квітнеючы сланечнік» (1999), «Блакітнае неба» (2000), партрэты. *Л.Ф.Салавей.*

ЦЮ́РЫН Іван Аляксеевіч (н. 25.12.1930, г. Адэса, Украіна), бел. балетмайстар. Засл. арт. Беларусі (1966). Скончыў Бел. харэаграфічнае вучылішча (1959). З 1946 у Ансамблі песні і танца Чарнаморскага флоту, у 1950—52 у Ансамблі нар. танца СССР, з 1954 у Дзярж. акад. нар. хоры Беларусі, у 1959—74 у Дзярж. ансамблі танца Беларусі, у 1977—80 у Ансамблі песні і танца БВА, у 1984—86 у Аб'яднанні муз. ансамбляў. Паставіў бел. нар. танцы «Лявоны», «Казыры», жанравыя карцінкі «Полька з прысядамі і камплімента мі», вак.-харэаграфічную кампазіцыю «Край ты мой квяцісты», сюіту «Свята ўраджаю», сюжэтныя мініяцюры «Стаіць вярба ў канцы сяла», «Вілейскія кавалеры», эстр.-развесяляльную праграму «Падарожжа ў джаз» і інш.

ЦЮ́РЫНА Кацярына Яўгенаўна (н. 15.7.1954, Мінск), бел. жывапісец. Дачка Я.А.*Зайцава*. Скончыла Бел. тэатр.-маст. ін-т (1979). З 1979 выкладае ў Бел. каледжы мастацтваў у Мінску. Працуе ў розных жанрах станковага жывапісу. Сярод твораў: «Салдаткі» (1979), «Векавая ліпа» (1980), «Восень у Ракаве» (1985), «Балерына» (1986), «Партрэт бацькі» (1987), «Вечар» (1988), «Высокі бераг» (1998), «Красавік» (2000), нацюрморты. Работы вылучаюцца энергічнай жывапіснай фактурай, тонкай нюансіроўкай настрою. *Л.Ф.Салавей.*

ЦЮРЫ́НГІЯ (Thüringen), зямля (адм. адзінка) у цэнтр. ч. Германіі. Пл. 16,25 тыс. км². Нас. 2,52 млн. чал. (1994).



Адм. ц. — г. *Эрфурт*. Найб. гарады: Гера, Іена, Веймар, Альтэнбург, Гота, Зуль. На Пн горы Гарц, на Пд горны хрыбет Цюрынгенскі Лес (выш. да 982 м), паміж імі тэктанічная катлавіна — Цюрынгенскі басейн. Клімат умераны, пераходны да кантынентальнага. Сярэднія т-ры студз. ад -0,2 да -2,2 °С, ліп. 15,5—17,8 °С. Ападкаў 450—600 мм за год. Гал. рака — Заале. Участкі лясоў (хвоя, дуб, бук, граб) пераважна ў гарах. Эканоміка індустр.-агр. тыпу. Прам-сць: машынабудаванне (с.-г. машыны, экскаватары, рухавікі, паляўнічая зброя, абсталяванне для тэкст. прам-сці і інш.), эл.-тэхн., аптычная, хім. і хім.-фармацэўтычная, лёгкая (шарсцяная, швейная, абуткавая), паліграф., мэблевая, харчовая. Вырошчваюць збожжавыя (пшаніца, ячмень), тэхн. (цукр. буракі) і кармавыя культуры. Бульбаводства, агародніцтва. Садоўніцтва. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней. Транспарт чыг., аўтамабільны. Турызм.

У раннім сярэдневякоўі — тэр. рассялення герм. племя цюрынгаў. З 1130 ландграфства, з 1247 (фактычна з 1264) уладанне мейсенскіх маркграфаў Ветынаў (з 15 ст. курфюрсты саксонскія). Паўн. Ц. ў 1485 перайшла да альберцінскай лініі Ветынаў і з сярэдзіны 16 ст. стала ч. курфюрства, потым каралеўства Саксонія; у 1814—15 перададзена Прусіі. У паўд. Ц. (адышла да эрнесцінскай лініі Ветынаў) утварылася шмат княстваў, колькасць і тэр. якіх мяняліся. У выніку *ліставадаўскай рэвалюцыі 1918* княствы ліквідаваны, у 1920 утворана зямля Ц. (гал. горад — Веймар). Пасля 2-й сусв. вайны (1945) у сав. зоне акупацыі, з 1946 зямля з адм. цэнтрам у г. Эрфурт. З 1949 у складзе ГДР (у 1952 падзелена на акругі Эрфурт, Гера і Зуль), з 1990 зноў зямля Ц. ў адзінай Германіі.

ЦЮ́РЫХ (Zürich), горад на Пн Швейцарыі. Адм. ц. аднайм. кантона. 343 тыс. ж. (1992), з прыгарадамі 835 тыс. Порт на *Цюрыхскім возеры* і р. Лімат. Буйны трансп. вузел. Міжнар. аэрапорт. Гал. прамысл. і гандл.-фінансавы цэнтр краіны. Прам-сць: маш.-буд., хім., тэкст., швейная, дрэваапр., паліграф., харчовая. Ун-т. Музеі: швейцарскі, Кунстхаўз (мастацтва 14—20 ст.), маст. рамёстваў. Арх. помнікі: раманска-га-

Цюрых. Панарама горада.

тычныя саборы Гросмюнстэр (12—15 ст.), Фраўмюнстэр (13—14 ст.), ратуша (17 ст.), барочныя дамы рамесных гільдый (17—18 ст.).

Узнік у 6 ст. на месцы кельцка-герм. паселішча Турыкум. Як горад упершыню ўпамінаецца ў 929; у 1218 атрымаў статус імперскага горада. У выніку паўстання 1336 рамеснікі Ц. дамагліся прадстаўніцтва ў гар. кіраванні. У 1351 далучыўся да Швейц. канфедэрацыі, стаў гал. горадам аднайм. кантона. У 16 ст. Ц. — адзін з цэнтраў Рэфармацыі ў Швейцарыі, якой кіраваў У.*Цвінглі*. Секулярызацыя манастырскіх зямель і інш. дзеянні выклікалі ў 1529 і 1531 канфлікт з каталіцкімі кантонамі. У 1799 каля Ц. адбылася бітва паміж рас. і франц. войскамі ў час вайны 2-й кааліцыі супраць Францыі, якая скончылася паражэннем рас. армій. У 2-й пал. 19 ст. Ц. — буйны банкаўскі, прамысл. і культ. цэнтр. У 19 — пач. 20 ст. адзін з цэнтраў рэв. эміграцыі.

ЦЮ́РЫХСКАЕ ВО́ЗЕРА (Zürichsee). У Швейцарыі, каля паўн. падножжаў Гларнскіх Альпаў. Размешчана ў стараж.-ледавіковай катлавіне на выш. 406 м. Пл. 88,5 км^3, даўж. 40 км, шыр. 1—4 км, глыб. да 143 м. Падзелена на 2 ч. касой і чыг. дамбай. Сцёк праз р. Лімат у р. Аарэ (прыток Рэйна). Суднаходства. Рыбалоўства. Курорты. На паўн.-зах. беразе — г. *Цюрых*.

ЦЮ́РЫХСКІЯ МІ́РНЫЯ ДАГАВО́РЫ, дагаворы паміж Францыяй, Аўстрыяй і Сардзінскім каралеўствам, якія замацавалі Вілафранкскае перамір'е 1859, завяршылі *аўстра-італа-французскую вайну 1859* перадачай часткі Ламбардыі Сардзінскаму каралеўству (гл. таксама *Ламбарда-Венецыянскае каралеўства*).

ЦЮРЭ́Н (Turenne) Анры дэ Ла Тур д'Аверн (La Tour d'Auvergne) віконт дэ (11.9.1611, г. Седан, Францыя — 27.7.1675), французскі палкаводзец, маршал (1643), гал. маршал Францыі (1660). Сын герцага Буйёнскага (аднаго з правадыроў гугенотаў), унук *Вільгельма I Аранскага*. З 1620 у галандскай арміі, вывучаў ваен. справу пад кіраўніцтвам свайго дзядзькі прынца *Морыца Аранскага*. З 1630 на франц. ваен. службе. У час *Трыццацігадовай вайны 1618—48* камандаваў франц. арміяй у Германіі, дзе атрымаў шэраг перамог. У 1648—51 удзельнічаў у *Фрондзе*, але ў маі 1651 перайшоў на бок караля і ўзначаліў армію, накіраваную супраць франдзёраў. Узначальваў франц. армію ў войнах з Іспаніяй (1667—68) і Нідэрландамі (1672—78). Забіты ў баі. Аўтар твораў па ваен. тактыцы і мемуараў.

ЦЮ́ТЧАЎ Іван Артамонавіч (24.3.1834, г. Тамбоў, Расія — 14.2.1893), расійскі і бел. хімік і мінералог; адзін з пачынальнікаў хім. навукі і асветы на Беларусі. Скончыў Пецярб. ун-т (1856). З 1857 праф. хіміі Горы-Горацкага земляробчага ін-та. З 1862 у Кіеўскім ун-це. З 1869 дырэктар Новаалександрыйскага ін-та сельскай гаспадаркі і лесаводства Люблінскай губ. Асн. працы па арган. хіміі, аналізе мінер. сыравіны, хім. тэхналогіі. Ажыццявіў першую спробу каталітычнага крэкінгу нафты. Аўтар падручнікаў па хіміі і крышталяграфіі.

Тв.: Начальные основания минеральной химии. Киев, 1868.

ЦЮ́ТЧАЎ Фёдар Іванавіч (5.12.1803, с. Аўстуг Бранскай вобл., Расія — 27.7.1873), рускі паэт. Скончыў Маскоўскі ун-т (1821). З 1821 на службе ў Калегіі замежных спраў, з 1822 пры рас. дыпламат. місіях у Мюнхене, у 1837—39 у Турыне. У 1844 вярнуўся ў Расію. З 1848 старшы цэнзар у Мін-ве замежных спраў, з 1858 узначальваў К-т замежнай цэнзуры. Дэбютаваў у 1819 як перакладчык. Першая кніга вершаў выдадзена ў 1854, другая — у 1868. У філас. лірыцы — матывы трагічнай раздвоенасці душы, адзіноты і згубленасці ў сусвеце, тэмы «хаосу» і «бездані», прарочых адкрыццяў, бясследнасці жыцця, памяці і пакут. У вершах пра каханне, у т.л. ў «Дзянісьеўскім цыкле», аголеная бязлітаснасць самааналізу. У публіцыстыцы, схільнай да панславізму, знаходзіў сувязь паміж развіццём індывідуалізму і разбуральнымі рэв. працэсамі ў Еўропе (арт. «Расія і рэвалюцыя», 1849; «Папства і рымскае пытанне», 1850). Многія яго вершы пакладзены на музыку. Перакладаў творы Гарацыя, У.Шэкспіра, Дж.Байрана, І.В.Гётэ, Ф.Шылера, Г.Гейнэ і інш. На бел. мову асобныя яго вершы пераклалі В.Вітка, Х.Жычка, В.Зуёнак, Н.Макарэвіч, Ю.Свірка, І.Чыгрын і інш.

Ф.І.Цютчаў.

Тв.: Соч. Т. 1—2. М., 1980; Лирика. Т. 1—2. 2 изд. М., 1966; Стихотворения. Письма. Воспоминания современников. М., 1988.

Літ.: Озеров Л. Поэзия Тютчева. М., 1975; Пигарев К. Ф.И.Тютчев и его время. М., 1978; Григорьева А.Д. Слово в поэзии Тютчева. М., 1980; Осповат А.Л. «Как слово наше отзовется...» М., 1980; Королева И.А., Николаев А.А. Ф.И.Тютчев: Библиогр. указ. М., 1978.

ЦЮФЯ́К, старажытная агнястрэльная гармата для стральбы каменным і метал. шротам па жывой сіле праціўніка на блізкія адлегласці. Упершыню згадваюцца ў канцы 13 ст.; у 15—16 заменены гаўфніцай (старадаўняя назва першых рус. *гаўбіц*). Гл. таксама *Шротаўніца*.

Прызначаўся для абароны і аблогі ўмацаваных гарадоў; стральба вялася, як правіла, з козлаў або калоды. Ствалы Ц. пераважна канічныя (для лепшага разлёту шроту), мелі раструб ад 76 да 200 мм, даўжыню ствала 0,9—1,1 м, масу 60—120 кг.

ЦЯ́ГА ў тэхніцы, 1) рухальная сіла, што перадаецца *рухачу* трансп. машыны (наземнай, воднай, паветранай, касмічнай) ад яе рухавіка. Бывае эл., паравая, *рэактыўная цяга* і інш. У адносінах да цягавых трансп. машын пад Ц. разумеюць сілу, якая перадаецца ад цягача (або лакаматыва) да прычэпа (або поезда). 2) Дэталь (звычайна стрыжань), якая звязвае асобныя звёны механізма і перадае пераважна цягавыя намаганні ад аднаго з іх да другога (напр., рулявая і тармазная Ц. аўтамабіля). 3) Разрэджванне ў пэўным участку трубапровода ці канала, у выніку чаго ўзнікае (узмацняецца) паток паветра ці газу.

Бывае натуральная (ствараецца з-за рознасці шчыльнасцей атм. паветра і газаў у газаходах, дымавой або вентыляцыйнай трубе) і штучная (ствараецца дымасосам ці вентылятарам). Натуральная Ц. нарастае з павелічэннем вышыні выцяжной або дымавой трубы, з паніжэннем т-ры атм. паветра і з павышэннем т-ры газаў у трубе.

Цюрыхскае возера.

ЦЯ́ГАВАЯ ПАДСТА́НЦЫЯ, электрычная *падстанцыя*, прызначаная для сілкавання токам рухавікоў эл. *цягі* на чыгунках, метрапалітэне, прамысл. электратранспарце, трамвайных і тралейбусных лініях. Будуюцца ў выглядзе

трансфарматарных падстанцый і *пераўтваральных падстанцый*.

Трансфарматарныя Ц.п. служаць для паніжэння напружання 3-фазнага току (ад *энергасістэмы*) да 27,5 кВ, неабходнага для работы чыг. рухомага саставу, і 6—10 кВ — для прамысл. транспарту, а таксама 1-фазнага току ад спец. электрастанцый. Пераўтваральныя Ц.п. выкарыстоўваюцца на лініях, што працуюць на пастаянным току. Яны пераўтвараюць 3-фазны пераменны ток (ад энергасістэмы) у пастаянны (напружаннем 275 В для падземнага эл. транспарту, 600 і 825 В для гар. і прамысл., 1650 В для прамысл. транспарту, 3300 В для магістральных чыгунак) або ў 1-фазны пераменны паніжанай частаты. Адрозніваюць Ц.п. адкрытага і закрытага (размешчаны ў асобных памяшканнях) тыпаў, перасоўныя (звычайна на чыг. платформах). Чыг. Ц.п. выкарыстоўваюць для сілкавання і нецягавых спажыўцоў, размешчаных паблізу электрыфікаваных чыгунак.

ЦЯГА́КА Лідзія Іванаўна (н. 21.2.1937, г.п. Кампанееўка Кіраваградскай вобл., Украіна), бел. антраполаг. Д-р мед. н. (1990), праф. (1998). Скончыла Мінскі мед. ін-т (1960). З 1969 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нац. АН Беларусі (з 1990 заг. аддзела). Даследуе праблемы часавай і прасторавай зменлівасці морфафункцыянальных прыкмет людзей, варыябельнасць дэрматагліфічных і аданталагічных прыкмет этнагенетычных працэсаў на тэр. Беларусі. Аўтар «Нарысаў па антрапалогіі Беларусі» (1976, з І.І.Салівон, А.І.Мікулічам), падручніка «Асновы сучаснай антрапалогіі» (1989, з Салівон). Дзярж. прэмія Беларусі 1999.

Тв.: Антропология Белорусского Полесья: (Демография, этнич. история и генетика). Мн., 1978 (разам з А.І.Мікулічам, І.І.Салівон); Биологическое и социальное в формировании антропологических особенностей (по данным исследования населения Позорья). Мн., 1981 (з імі ж); Дерматоглифика населения Белоруссии: Популяционные аспекты изменчивости. Мн., 1989; Расавая геаграфія беларусаў і праблемы этнагенезу. Мн., 1994 (разам з В.П.Аляксеевым, М.У.Вітавым); Основы антропологии и экологии человека. Мн., 1997 (разам з І.І.Салівон).

ЦЯГА́Ч, машына для буксіроўкі прычэпаў, паўпрычэпаў і інш., а таксама ўстаноўкі навяснога с.-г., дарожна-буд. і інш. абсталявання. Мае счэпны механізм, прыстасаванні для далучэння да тармазной сістэмы і электраабсталявання прычэпа.

Адрозніваюць буксірныя і седлавыя Ц. Буксірныя Ц. маюць цягава-счэпны механізм. Для павелічэння счэпнай вагі пры транспартаванні непадзельных і цяжкавагавых грузаў кузаў Ц. дадаткова нагружаюць балластам (баластавыя Ц.). У седлавых Ц. замест грузавой платформы ўстаноўлены апорна-счэпны механізм (сядло) для злучэння з рамай паўпрычэпаў. У параўнанні са звычайнымі трактарамі і аўтамабілямі Ц. маюць павышаную магутнасць рухавіка, большыя перадатачныя адносіны ў сілавой перадачы, укарочаную базу.

На Беларусі Ц. распрацоўваюць і выпускаюць прадпрыемствы вытв. аб'яднання «БелаўтаМАЗ» і Мінскі з-д колавых цягачоў.

ЦЯГЛО́, 1) адработачная рэнта, адна з асноўных сял. павіннасцей у ВКЛ у 15—18 ст. (гл. *Паншчына, Цяглыя сяляне*). 2) Падатковая адзінка вясковага і пасадскага насельніцтва ў Расіі 15 — пач. 18 ст. У Ц. ўваходзіў комплекс натуральных і грашовых павіннасцей, якія плаціліся дзяржаве. У 15—16 ст. у аснове абкладання Ц. ляжаў пазямельны ўлік (гл. *Пасошнае, Саха*), які ў апошняй чвэрці 17 ст. заменены падворным улікам (гл. *Падворнае абкладанне*). У 1724 замест цяглавай сістэмы збору дзярж. павіннасцей уведзены *падушны падатак*. За выкананнем Ц. прыватнаўласніцкімі сялянамі наглядалі іх уладальнікі, у *чарнасошных сялян* і *пасадскіх людзей* — выбарныя асобы. 3) Арганізац. адзінка сял. павіннасцей памешчыку і дзяржаве ў прыгоннай гаспадарцы Рас. імперыі ў 18 — 1-й пал. 19 ст. На Беларусі ўведзена ў канцы 18 ст. Уключала сям'ю з 2 працаздольных чал. (мужчыны і жанчыны). У Ц. запісваліся мужчыны ад 17—18 да 55—60 гадоў і жанчыны ад 16—17 да 50—55 гадоў. Кожнае Ц. абкладалася рознымі павіннасцямі: паншчынай, *аброкам* ці дзярж. падаткам. Умовай плацежаздольнасці Ц. было надзяленне яго зямлёй, жывёлай, інвентаром. Колькасцю Ц. вызначаўся эканам. стан памешчыцкай гаспадаркі. Памешчыкі імкнуліся захаваць паўнацэннасць Ц., таму перашкаджалі перараз-мяркоўвалі зямлю і інш. сродкі вытв-сці паміж слабымі і моцнымі Ц. Сял. двор складаўся звычайна з 1—3 Ц. Існавала Ц. да 1861, яго пережыткі захаваліся да 1917. 4) Сістэма дзярж. і феад. павіннасцей сялян і гараджан Расіі ў 15 — 1-й пал. 19 ст. *В.У.Чапко.*

ЦЯ́ГЛЫЯ СЯЛЯ́НЕ, катэгорыя феадальна-залежных сялян у ВКЛ і Расіі. 1) У ВКЛ у 15—18 ст. феадальна-залежныя сяляне, гал. формай зямельнай рэнты якіх была *паншчына*. На Полаччыне іх наз. таксама прыгоннымі людзьмі; у актах Метрыкі ВКЛ іх вызначалі як «с сохою, с серпом, с косою, с топором и иную тягль тянули по тому, как иншие селяне». Узніклі з развіццём *фальварка*, калі значная колькасць сялян розных катэгорый паводле характару гал. павіннасцей (*даннікаў*, сялян-слуг, *баяр*) пераведзена ў катэгорыю Ц.с. Да сярэдзіны 16 ст. ў бас. Нёмана і Буга Ц.с. сталі асн. катэгорыяй сялянства паводле характару гал. павіннасці. У ходзе *валочнай памеры* Ц.с. атрымалі надзел у адну *валоку* (21, 36 га; часта на 2 двары), якая служыла і адзінкай абкладання рознымі павіннасцямі. За карыстанне валокай зямлі Ц.с. адбывалі 2 дні паншчыны ў тыдзень, плацілі натуральныя і грашовыя падаткі, а таксама выконвалі інш. работы. На працягу 16—18 ст. іх зямельныя надзелы скарачаліся, павіннасці павялічваліся. 2) У Расіі ў 14 — 1-й пал. 19 ст. феадальна-залежныя сяляне, якія адбывалі *цягло* на карысць дзяржавы і феадалаў. Разам з *пасадскімі людзьмі* складалі цяглае насельніцтва. У 2-й пал. 17 ст. ў разрад Ц.с. уключаны і *бабылі*. Да 1679 існавала пазямельнае пасошнае, потым падворнае цягло. Пасля ўвядзення *падушнага падатку* (1724) Ц.с. наз. падатнымі людзьмі. У 18 — 1-й пал. 19 ст. цяглымі наз. памешчыцкіх сялян, якія мелі поўны зямельны надзел і адбывалі павіннасці памешчыку і дзяржаве ў памеры цэлага цягла. Сяляне, якія мелі палавіну зямельнага надзелу, наз. паўцяглымі і выконвалі павіннасці ў памеры палавіны цягла. Ц.с. зніклі разам з адменай прыгоннага права ў 1861.

Літ.: Спиридонов М.Ф. Закрепощение крестьянства Беларуси (XV—XVI вв.). Мн., 1993; Гісторыя сялянства Беларусі. Т. 1. Мн., 1997. *М.Ф.Спірыдонаў.*

ЦЯЖА́РНАСЦЬ, фізіялагічны працэс выношвання плода з моманту *апладнення* да *родаў* у чалавека і жывародных жывёл. У большасці млекакормячых апладненыя яйцаклеткі рухаюцца па яйцаводзе ў *матку* і ўкараняюцца ў яе сценку. На месцы ўкаранення фарміруецца *плацэнта*. З надыходам Ц. ў самкі спыняюцца палавыя цыклы, адбываюцца значныя змены ў гарманальным балансе, абменных і энергет. працэсах, павялічваецца патрэбнасць у пажыўных рэчывах, вітамінах. Працягласць Ц. ў буйных жывёл, дзіцяняты якіх адразу пасля нараджэння здольныя ісці ўслед за маці, ад 230 (алень, лось) да 660 сут (слон). У драпежнікаў, якія ўскормліваюць слепанароджаных дзіцянят (катоў, сабак, ваўкоў, рысей) ва ўкрыццях, Ц. цягнецца 56—72 сут, у малпаў — 4—9 месяцаў.

Ц. жанчыны цягнецца звычайна 280 сут (9 мес). Аб'ём маткі павялічваецца ў 500, яе маса ў 25 разоў. У час Ц. бывае моташнасць, ірвота, змена смаку і інш.; зніжаецца тонус маткі (для папярэджвання выкідыша). Ускладненні Ц. — *пазаматачная цяжарнасць, таксікозы цяжарнасці*. Сістэм. нагляд за цяжарнымі жанчынамі ажыццяўляюць жан. *кансультацыі*. *І.М.Семяненя.*

ЦЯЖКАВО́З, агульная назва спецыялізаваных парод рабочых коней. Адрозніваюцца масіўным целаскладам, вял. цяглавай сілай. Выкарыстоўваюцца ў с.-г. і трансп. работах. Да Ц. адносяцца *руская цяжкавозная парода, савецкая цяжкавозная парода, уладзімірская цяжкавозная парода*, ардэнская, брабансонская, брэтонская, булонская, клейдэздальская, першэронская, шайрская і інш.

ЦЯ́ЖКАСЦЕЙ МО́ЎНЫХ СЛО́ЎНІК, слоўнік, у якім падаюцца нарматыўныя фармальныя, зместавыя і функцыянальныя характарыстыкі моўных адзінак (афіксаў, слоў, словазлучэнняў), што стварацюць цяжкасці пры іх вусным і пісьмовым выкарыстанні. Падзяляюцца на 3 віды: слоўнікі лексічных цяжкасцей (напр., «Слоўнік паронімаў беларускай мовы» С.М.Грабчыкава, 1994; «Беларускія аднакарэнныя і сугучныя словы з рускімі адпаведнікамі» М.Ф.Смаршчок і Э.І.Барысаглебскай, 2002), слоў-

нікі грамат. цяжкасцей (напр., «Кіраванне ў беларускай і рускай мовах» Г.У.Арашонкавай і В.П.Лемцюговай, 1991), комплексныя слоўнікі моўных цяжкасцей (напр., «Слоўнік цяжкасцей беларускай мовы», 1987; «Кароткі слоўнік беларускай мовы: Правапіс. Вымаўленне. Націск. Словазмяненне. Словаўжыванне», абодва 1994, Арашонкавай і Лемцюговай). *В.К.Шчэрбін.*

ЦЯ́ЖКАЯ АТЛЕ́ТЫКА, від спорту; спаборніцтвы ў падыманні цяжару (штангі) у розных вагавых катэгорыях. Задача спартсмена — падняць і зафіксаваць над галавой штангу як мага большай масы. Штанга складаецца са стальнога стрыжня (грыфа) і набору стальных дыскаў масай ад 2,5 да 25 кг, якія надзяваюць на грыф з 2 бакоў і замацоўваюць на ім спец. замкамі. Сучасная праграма афіц. спаборніцтваў (з 1973) уключае 2 практыкаванні: рывок і штуршок дзвюма рукамі (пры рыўку штанга падымаецца з памоста ўверх на выпрастаныя рукі адным бесперапынным рухам, пры штуршку ў 2 прыёмы: пад'ём на грудзі і штуршок ад грудзей уверх). Вынікі рэгіструюцца ў кожным з практыкаванняў і па суме 2 практыкаванняў. На выкананне кожнага практыкавання даецца 3 падыходы (спробы).

Фіз. практыкаванні з цяжарамі вядомы са стараж. часоў. Афіц. спаборніцтвы ў падняцці цяжараў упершыню праведзены ў ЗША у 1860-я г. У Еўропе ў пач. 1870-х г. у Парыжы і Бруселі засн. школы Ц.а. Да пач. 20 ст. да Ц.а. адносілі бокс, барацьбу, падняцце цяжару (гіры і інш.), культурызм. Сучаснае тлумачэнне тэрміна «Ц.а.» з 1946. Да 1934 спартсмены спаборнічалі ў пяцібор'і (жым дзвюма рукамі, рывок і штуршок — адной і дзвюма), у 1934—72 — у класічным трохбор'і (жым, рывок і штуршок дзвюма рукамі), з 1973 жым выключаны з праграмы афіц. спаборніцтваў. З 1920 у Ц.а. ўведзены 5 вагавых катэгорый (вага спартсмена) для ўдзельнікаў спаборніцтваў; з 1977 — 10 катэгорый, з 1998 — 8 катэгорый: да 56 кг, да 62, 69, 77, 85, 94, 105 і больш за 105 кг. Першы чэмпіянат свету адбыўся ў 1891 (Лондан), першы чэмпіянат Еўропы — у 1896 (Ротэрдам). У 1912 засн. Сусв. цяжкаатлетычны саюз і зацверджаны правілы міжнар. спаборніцтваў; з 1920 дзейнічае міжнар. федэрацыя Ц.а. (ІВФ, IWF), аб'ядноўвае 167 краін (2000). З 1896 Ц.а. ў праграме Алімп. гульняў. На XXVII Алімп. гульнях (2000, г. Сідней. Аўстралія) упершыню спаборнічалі жанчыны (у 7 вагавых катэгорыях). У 1964—80 алімп. чэмпіёны лічыўся адначасова і чэмпіёнам свету. Найб. развіта Ц.а. ў Расіі, Кітаі, Балгарыі, Турцыі, Грэцыі, Беларусі, Украіне, Венгрыі, Польшчы, ЗША і інш.

Развіццё Ц.а. на Беларусі пачалося ў 1913 (спарт. т-ва «Санітас»). У 1914 у Мінску адбыліся першыя афіц. спаборніцтвы. Пяршынствы Беларусі праводзяцца з 1924. З 1946 бел. цяжкаатлеты ў складзе зборнай каманды СССР удзельнічалі ў чэмпіянатах Еўропы, свету, Алімп. гульнях і інш. (*Я.Новікаў* — 1-ы сярод бел. цяжкаатлетаў чэмпіён Еўропы, 1957). Федэрацыя Ц.а. Беларусі створана ў 1988, прызнана ІВФ у 1992, еўрап. федэрацыяй Ц.а. (ЕВФ, EWF) у 1993, НАК у 1994; з 1997 існуе грамадскае аб'яднанне «Бел. цяжкаатлетычны саюз». Сярод найб. вядомых настаўнікаў бел. цяжкаатлетаў: засл. трэнеры СССР і Беларусі У.П.Галіца, А.В.Ганчароў, П.Я.*Зубрылін*, А.Л.Лабачоў, І.П.Лагвіновіч, Н.А.Лапідус, Б.Д.Левін, М.М.Рабікоўскі, Г.Ф.Рабаконь, П.І.Савіцкі, В.Я.Шаршукоў. Сярод бел. спартсменаў найб. вызначыліся Г.Аляшчук, А.Анішчанка, Г.Бацюшка — удзельніца Алімп. гульняў (2000, 8-е месца), Р.*Белянкоў*, В.Бяляцкі, А.Галубовіч, В.Дзербянёў, У.Емяльянаў, А.Кечко, А.*Курловіч*, С.Лаўрэнаў, Р.Новікаў, В.Сіняк, Л.*Тараненка*, В.Харытончык, А.Чырыца, В.*Шарый*, В.Шэўчык.

Літ.: Иванов Д.И. Сила самых сильных: Тяжелая атлетика на Олимпиадах. М., 1979; Зейналов А.А., Цивес И.Л. Белорусские богатыри. Мн., 1979; Тяжелая атлетика. 3 изд. М., 1981; Ясный Э.М. Власть над судьбой и металлом. Мн., 1994. *М.Я.Вінічонак.*

ЦЯ́ЖКАЯ ВАДА́, ізатопная разнавіднасць *вады*, малекулы якой замест атамаў ^1H маюць атамы *дэйтэрыю*, D_2O. Атрымана ў 1933. Нязначная колькасць Ц.в. ёсць у прыродных водах і ў атм. ападках.

Фіз. ўласцівасцямі адрозніваецца ад звычайнай вады, $t_{пл}$ 3,813 °С, $t_{кіп}$ 101,43 °С. Хім. ўласцівасці амаль аднолькавыя, аднак рэакцыі і біял. працэсы ў Ц.в. ідуць больш павольна. Атрымліваюць ізатопным абменам паміж малекуламі вады і сераводароду, выдаленнем з астатку электраліту пры многаступеньчатым электролізе вады і інш. Выкарыстоўваюць для атрымання D_2, як запавольнік нейтронаў у ядз. рэактарах і інш. Існуе таксама звышцяжкая вада (злучэнне T_2O, дзе Т — *трытый*). Прыгнечвае жыццядзейнасць жывых арганізмаў.

ЦЯ́ЖКАЯ МА́СА, тое, што *гравітацыйная маса*. Гл. таксама *Маса*.

ЦЯ́ЖКІ Артур Іосіфавіч (23.7.1943, в. Лылойці Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл. — 5.4.1984), бел. пісьменнік. Скончыў БДУ (1974). Працаваў у рэдакцыях раённых і рэсп. газет, з 1981 у Гродзенскім навук.-метадычным цэнтры нар. творчасці. Друкаваўся з 1957. У зб-ках апавяд. «Сустрэча пасля вясны» (1980), «Пара блакітных дажджоў» (1982), аповесцей і апавяд. «Дзе мой дом?..» (1986) роздум над сэнсам жыцця, паводзіны чалавека ў цяжкіх сітуацыях. *Г.В.Якаўлева.*

ЦЯ́ЖКІ БЕТО́Н, цэментны бетон, найбольш пашыраны бетон, у якім запаўняльнікі — шчыльныя горныя пароды і пяскі. У якасці вяжучага рэчыва выкарыстоўваюць партландцэмент, гліназёмісты *цэмент* і інш. Звычайны Ц.б. (шчыльнасць да 2500 кг/м^3) выкарыстоўваюць пры ўзвядзенні нясучых канструкцый і *фундаментаў* прамысл. і грамадз. будынкаў, плацін і інш. Асабліва цяжкі (больш за 2500 кг/м^3) з цяжкімі прыроднымі і штучнымі запаўняльнікамі (жал. руда, чыгунны скрап) — для біял. аховы ад радыеактыўных выпрамяненняў пры будаванні ядз. установак, АЭС. *Я.М.Кавалёў.*

ЦЯ́ЖКІ ВАДАРО́Д, тое, што *дэйтэрый*.

ЦЯ́ЖКІ ШПАТ, другая назва мінерала *барыт*.

ЦЯ́ЖКІЯ МЕТА́ЛЫ, каляровыя металы са шчыльнасцю большай, чым у жалеза. Да іх адносяцца: *свінец, медзь, цынк, нікель, кадмій, кобальт, сурма, волава, вісмут, ртуць*. Большасць Ц.м. таксічныя. Антрапагеннае рассеянне Ц.м. у біясферы, у т.л. ў выглядзе солей, вядзе да назапашвання іх у глебе і раслінах і атручэння жывёл і чалавека.

ЦЯ́ЖКІЯ МІНЕРА́ЛЫ, мінералы, якія маюць шчыльнасць больш за 2,8 г/см^3. Складаюць невял. частку абломкавых горных парод, але вельмі разнастайныя (некалькі дзесяткаў мінер. відаў) і маюць рознае паходжанне. Асн. маса Ц.м. мае шчыльнасць 2,8—5 г/см^3.

Паводле распаўсюджанасці ў зямной кары падзяляюцца на 3 групы: вельмі пашыраныя (амфіболы, гранаты, ільменіт, цыркон, эпідот — доля кожнага з іх 10—20% ад цяжкай фракцыі абломкавых парод); умерана пашыраныя (біятыт, ліманіт, магнетыт, турмалін, апатыт, піраксены, рутыл, стаўраліт, 1—10%); рэдкія — менш за 1% і ў выглядзе адзінкавых зерняў (дыстэн, сфен, лейкаксен, сіліманіт, мускавіт, тапаз, манацыт, глаўканіт і інш.). Аналіз колькасці Ц.м. у пародах праводзіцца пры пошукавых работах і палеарэканструкцыях. *У.Я.Бардон.*

ЦЯКУ́ЦЬЕЎ Іван Пятровіч, расійскі служылы чалавек, падарожнік і дыпламат бел. паходжання 17 ст. З «ліцвінаў», што трапілі ў рус. палон і прысягнулі на вернасць рас. цару. Каля 30 гадоў служыў у Сібіры, быў дзесятнікам у г. Цюмень. У 1615 пасланы з Томска на пошукі шляхоў у Кітай і па гандл. справах. Ц. і яго спадарожнікі першымі з рускіх і еўрапейцаў праехалі праз Хакасію, Кузнецкі Алатау і міма воз. Убсу-Нур у Манголію (1616) да яе правіцеля Алтан-хана, які ў адказ на візіт накіраваў з Ц. сваіх паслоў да рас. цара. Так быў пакладзены пачатак афіц. рас.-манг. адносінам. За ўдалую місію Ц. у 1617 узведзены ў «дзеці баярскія» (служылыя дваране). У Томску, Табольску і Маскве са слоў Ц. і яго спадарожнікаў запісаны іх справаздачы («артыкульныя спісы») з каштоўнымі звесткамі пра фіз. геаграфію і насельніцтва мясцін па маршруце экспедыцыі (паўд. Сібір, паўн. Манголія), а таксама пра Кітай і Тыбет (з паведамленняў Алтан-хана). Падарожжа Ц. спрыяла паспяховасці першай рас. дыпламат. місіі на чале з дзякам І.Пяцеліным у Кітай (1618). Матэрыялы Ц. і Пяцеліна ў 17—18 ст. неаднаразова перакладаліся на еўрап. мовы і сталі набыткам еўрап. навукі. *В.А.Ярмоленка.*

ЦЯКУ́ЧАСЦЬ, уласцівасць цела пластычна ці вязка дэфармавацца пад уздзеяннем *напружанняў механічных*. Харак-

тарызуецца велічынёй, адваротнай *вязкасці*. У газападобных і вадкіх цел выяўляецца пры любых напружаннях, у цвёрдых — пры напружаннях, якія перавышаюць ліміт Ц. (гл. *Паўзучасць, Пластычнасць*). Вывучаецца *рэалогіяй*.

У газах Ц. звязана з перадачай імпульсу ад слаёў, малекулы якіх маюць пераважны рух у напрамку зададзенага цячэння, да слаёў, дзе такі рух меншы. У вадкасцей Ц. абумоўлена пераважнасцю дыфузіі ў напрамку дзеяння напружанняў. Элементарны акт Ц. пры гэтым — скачкападобнае перамяшчэнне малекул (ці сегмента макрамалекулярнага ланцужка ў высокамалекулярных рэчывах), якое суправаджаецца пераходам праз энергет. бар'ер (гл. таксама *Звышцякучасць*). У крышталічных цвёрдых цел Ц. звязваюць з рухам розных крышталічных дэфектаў (гл. *Дэфекты ў крышталях*), а таксама з *двайнікаваннем* пад уздзеяннем напружанняў.

Літ.: Работнов Ю.Н. Механика деформируемого твердого тела. 2 изд. М., 1988.

ЦЯЛГЕ́НІЦА, другая назва возера *Цеменіца* ў Лепельскім р-не Віцебскай вобл.

ЦЯЛЕ́ГІН Дзмітрый Якаўлевіч (н. 26.10.1919, с. Плысавое Лазаўскога р-на Харкаўскай вобл., Украіна), украінскі археолаг. Д-р гіст. н. (1967), праф. (1976). Скончыў Чарнавіцкі ун-т (1949). У 1952—89 працаваў у Ін-це археалогіі АН Украіны. Даследуе старажытнасці каменнага, меднага і бронзавага вякоў Украіны і сумежных тэрыторый, у т.л. паўд.-ўсх. Беларусі. Аўтар больш як 300 навук. прац, у т.л. па мезаліце Украіны, днепра-данецкай культуры, па энеаліце Падняпроўя. Дзярж. прэмія Украіны 1977.

Тв.: Дніпро-донецька культура: До історії населення епохи неоліту — раннього металу півдня Східної Європи. Київ, 1968; Памятники эпохи мезолита на территории Украинской ССР. Киев, 1985. *М.М.Чарняўскі.*

ЦЯЛЕ́СНЫ ВУ́ГАЛ, частка прасторы, абмежаваная пэўнай канічнай паверхняй (гл. *Конус*).

Прыватныя выпадкі Ц.в. — трохгранныя і шматгранныя вуглы. Значэнне Ц.в. (у *стэрадыянах*) роўнае адносінам плошчы S той часткі сферы з цэнтрам у вяршыні канічнай паверхні, што выразана гэтым Ц.в., да квадрата радыуса сферы. Напр., велічыня Ц.в., абмежаванага актантам ($^1/_8$ частка прасторы), роўна $\frac{4\pi R^2}{8R^2}=\frac{\pi}{2}$, дзе R — радыус сферы.

Цялесны вугал.

ЦЯЛЕ́СНЫЯ ПАКАРА́ННІ, у антычным і сярэдневяковым праве мера крымін. пакарання, якая заключалася ў прычыненні асуджанаму фіз. пакут. Падзяляліся на членашкодніцкія (адразанне языка, вуха, вырыванне ноздраў, адсячэнне канечнасцей); балючыя (лупцаванне бізунамі, палкамі, дубцамі); ганьбячыя (выстаўленне каля ганебнага слупа, кляйменне) і інш. Выкарыстоўваліся таксама ў судаводстве Расіі і ВКЛ, асабліва для злачынцаў з ніжэйшых і сярэдніх слаёў насельніцтва (дваранства і шляхта Ц.п. не падлягалі). У шэрагу краін існавалі да 20 ст. У Расіі часткова адменены ў 1863, канчаткова — у 1904. *Г.А.Маслыка.*

ЦЯЛЕ́Ц (лац. Taurus), адно з 12 сузор'яў *задыяка*. Найб. яркія зоркі *Альдэбаран*, Нат, *Альцыёна* і ξ Ц., адпаведна 0,8; 1,6; 2,9 і 3,0 візуальнай *зорнай велічыні*; 125 зорак ярчэй 6-й зорнай велічыні. У Ц. знаходзяцца 2 рассеяныя *зорныя скопішчы: Плеяды* і *Гіяды*, а таксама магутная крыніца эл.-магн. выпрамянення — *Крабападобная туманнасць*. З тэр. Беларусі відаць увосень і зімой. Гл. *Зорнае неба*.



Сузор'е **Цялец**.

ЦЯЛЕ́ЦКАЕ ВО́ЗЕРА, Алтынколь, Залатое возера. На ПнУ Алтая, у Алтайскім краі (Расія), на выш. 436 м. Пл. 223 км^2, даўж. 77,7 км, шыр. да 5,2 км, глыб. да 325 м. Катлавіна тэктанічнага паходжання. Берагі стромкія, скалістыя. Упадае каля 70 рэк, у т.л. Чулышман, выцякае р. Бія. Ледастаў няўстойлівы. Вада вельмі празрыстая (да 14 м.). На берагах — пас. Артыбаш, Іагач і Яйлю з цэнтр. сядзібай Алтайскага запаведніка і Цялецкай азёрнай станцыяй. Раён турызму і адпачынку.

ЦЯЛУ́ША, вёска ў Бабруйскім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 20 км на ПдУ ад г. Бабруйск, 120 км ад Магілёва, 15 км ад чыг. ст. Цялуша. 588 ж., 257 двароў (2003). Сярэдняя школа-сад, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Магіла Н.А.Варанцовай-Вельямінавай (унучка А.С.Пушкіна). Помнік архітэктуры — Свята-Мікольская царква (канец 19 ст.).

ЦЯЛЬКО́ВА Алена Сяргееўна (н. 7.5.1944, г. Пінск Брэсцкай вобл.), бел. спявачка (сапрана). Засл. арт. Беларусі (1991). Скончыла Мінскае муз. вучылішча імя М.Глінкі (1970). З 1966 салістка жан. вак. квартэта *«Купалінка»*, з 1988 адна са стваральніц, маст. кіраўнік і салістка аднайм. фалькгрупы. Валодае голасам сакавітага тэмбру, шырокім пеўчым дыяпазонам. Адраджае традыцыі бел. муз.-песеннага мастацтва, збірае бел. нар. песенны фальклор, які ў рэпертуары групы выконваецца ў рэгіянальных традыцыях спеваў (пераважна Мінскага, Брэсцкага і Гомельскага р-наў). Аўтар муз. кампазіцый «Купалле», «На кірмашы», «Прыйдзі, вясна», апрацовак бел. нар. песень. Адна з аўтараў кінафільмаў «Квартэт «Купалінка», «Спявае «Купалінка», «Купалінка». *І.Л.Чэбан.*

ЦЯЛЯ́КАВА, вёска ва Уздзенскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 15 км на ПнУ ад г. Узда, 50 км ад Мінска, 37 км ад чыг. ст. Негарэлае. 212 ж., 105 двароў (2003). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЦЯМЛЯ́К (цюрк.), сагнутая папалам тасьма (ніцяная, скураная або з галуну) з кутасом на канцы, якую носяць на эфесе (рукаятцы) мяча, шаблі, шашкі, шпагі. Воіны рыцарскага войска (14—15 ст.) у баі надзявалі Ц. на запясце для больш надзейнага ўтрымання зброі. Пазней у арміях розных краін Ц. сталі насіць паводле ўстаноўленай формы афіцэры, а таксама і салдаты. У рас. арміі Ц. быў знакам узнагароды (Ц. з георгіеўскай стужкай або стужкай ордэна св. Ганны 4-й ступені). Захаваўся толькі ў афіцэраў роты ганаровай варты і асістэнтаў пры баявым сцягу (гл. таксама *Сцяг воінскі*).

ЦЯМЧУ́К Васіль Іванавіч (1920, в. Дзедава Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 22.10.1943), Герой Сав. Саюза (1943). Да вайны працаваў шахцёрам у Варашылаўградскай (цяпер Луганскай) вобл. на Украіне. У Вял. Айч. вайну з чэрв. 1941 на фронце. Вызначыўся ў баях пры фарсіраванні р. Дняпро: 22.10.1943 гарматны разлік зенітнага артыл. палка, адбіваючы налёты варожай

В.І.Цямчук.

авіяцыі, збіў 5 самалётаў. Загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў с. Ходараў Міронаўскага р-на Кіеўскай вобл. На будынку сярэдняй школы чыг. ст. Тошчыца Быхаўскага р-на яму ўстаноўлена мемар. дошка.

ЦЯНЁТЫ, 1) у беларусаў паляўнічыя сеткі для лоўлі звяроў і птушак. Звер натыкаецца на развешаную на калках сетку скідвае яе і заблытваецца ў ёй. На курапатак, перапёлак і інш. ставілі пераважна 2-сценныя Ц. (адна сетка з малымі вочкамі, другая — з вял.). Птушка ўдараецца ў густую сетку, набірае яе на сябе, праходзіць праз вочка рэдкай і ўтварае мяшок-пастку. Ц. выкарыстоўвалі да 20 ст. 2) У пераносным сэнсе Ц. наз. пастку для людзей і ўсё тое, што прыгнятае, перашкаджае свабодна дзейнічаць.

ЦЯНЬ СЮЕСЕ́НЬ (н. 11.12.1911, г. Ханчжоў, Кітай), кітайскі вучоны і канструктар у галіне ракетабудавання і касманаўтыкі. Акад. АН КНР, д-р н. (1940), праф. (1947). Скончыў Шанхайскі політэхн. ін-т «Цзяатун» (1934) і Масачусецкі тэхнал. ін-т (1939). У 1939—55 у ЗША; працаваў ў Масачусецкім і Каліфарнійскім тэхнал. ін-тах. У 1950—55 пад дамашнім арыштам. З 1955 у Кітаі, арганізатар і кіраўнік Пятай акадэміі пры мін-ве абароны КНР. Канструктар першага кіт. ШСЗ «Дунфанхун І» (1970), міжкантынент. ракеты «М-9»; пад яго кіраўніцтвам ажыццяўляецца касм. праграма КНР (да 2000 запушчана 75 ШСЗ). *Сю Лін.*

ЦЯНЬЦЗІ́НСКІ ТРАКТА́Т 1858 паміж Кітаем і Расіяй. Заключаны 13.6.1858 у г. Цяньцзінь (Кітай). Пашыраў правы рас. купцоў у Кітаі, даваў Расіі права прызначаць консулаў у кіт. парты, адкрытыя для рас. гандл. суднаў, пашырыў на іх *рэжым найбольшага спрыяння*.

ЦЯНЬ-ША́НЬ (кіт. Нябесныя горы), горная сістэма ў Цэнтр. Азіі. Зах. ч. знаходзіцца пераважна ў Кыргызстане; часткова ў Казахстане, Узбекістане, Таджыкістане, усх. — у Кітаі. Цягнецца з З на У амаль на 2500 км. На ПдЗ Алайскім хр. злучаецца з сістэмай Памірà-Алая, на ПнУ хрыбтом Борахара з хр. Джунгарскі Алатау. Найвыш. пункты — пік Перамогі (7439 м) і *Хан-Тэнгры* (6995). Паводле фізіка-геагр. раянавання вылучаюць (акрамя кіт. ч.) Ц.-Ш. Зах., Паўн., Унутр. і Цэнтральны. Асн. хрыбты і ўпадзіны, што іх падзяляюць, маюць шыротнае і субшыротнае распасціранне. Рэльеф пераважна высакагорны з ледавіковымі формамі, на схілах — восыпны, вышэй за 3200 м — шматгадовая мерзлата. Буйныя міжгорныя (Ферганская, Ісык-Кульская, Нарынская і інш.) і ўскраінныя (Чуйская, Талаская) упадзіны з рачнымі далінамі, азёрамі і балотамі.

Геал. структура Ц.-Ш. ўзнікла ў выніку альпійскіх рухаў на месцы эпіпалеазойскага пенеплена, рэшткі якога захаваліся на выш. 3000—4000 м у выглядзе *сыртаў*. Горныя хрыбты складзены пераважна з асадкавых, метамарфічных і магматычных парод, катлавіны — з асадкавых адкладаў. Частыя землетрасенні. Радовішчы руд ртуці, сурмы, свінцу, цынку, серабра, волава, вальфраму, ва ўпадзінах — нафты, каменнага і бурага вугалю і інш. Клімат рэзка кантынентальны. У далінах ніжняга пояса гор сярэднія т-ры ліп. 20—25 °С, у сярэдневышынных далінах 15—17 °С, каля падножжаў ледавікоў 5 °С і ніжэй; т-ра студз. ў нізкагорнай зоне -5-8 °С, на высакагор'ях ад -17 да -22 °С, ападкаў ад 300 мм у перадгор'ях да 800 мм за год у высакагор'ях. Снегавая лінія ў Зах. Ц.-Ш. на выш. 3600—3800 м, у Цэнтр. — на выш. 4200—4450 м. Плошча сучаснага зледзянення 7,3 тыс. км² (больш за 7700 ледавікоў, найбуйн. Паўд. і Паўн. Энгільчэк, Каінды, Мушкетава). Рэкі належаць да ўнутр. басейнаў Цэнтр. Азіі, найбуйн. Нарын, Сары-Джаз, Сырдар'я, Ілі, Чу, Тарым, Канчэдар'я. Маюць пераважна ледавіковае і снегавое (летняя паводка) жыўленне. Найбуйн. азёры: *Ісык-Куль*, Сонг-Кёль, Чатыр-Кёль. У Цэнтр. Ц.-Ш. выражана вышынная пояснасць ландшафтаў. Раўніны заняты гліністымі палыннымі і салянкавымі пустынямі, якія на Пд пераходзяць у палына-эфемеравыя пустыні. На падгорных раўнінах і ў нізкіх перадгор'ях паўпустыні або пустынныя стэпы з перавагай эфемераў і эфемероідаў. Вышэй за 900—1200 м — горна-стэпавы пояс, прадстаўлены злакава-разнатраўнымі стэпамі на Пн і высакатраўнымі паўсаваннамі на Пд. Вышэй за 1200—2000 м — лугавыя стэпы, хмызняковыя зараснікі і лісцевыя лясы. Лясы грэцкага арэха (на зах. схілах Ферганскага хр., паўд. схіле Чаткальскага і ў Зах. Ц.-Ш.) да 1700 м на Пн, да 2500—3000 м на Пд, змяняюцца хвойнымі з цянь-шаньскай елкі і піхты. Субальпійскія і альпійскія лугі пашыраны пераважна на паўн. схілах (на выш. 2800—3400 м). На сыртах — ландшафты халодных пустынь. На выш. 3600—3800 м — ландшафты гляцыяльна-нівальнага пояса. Ва ўнутр. далінах і катлавінах — камяністыя пустыні, паўпустыні і сухія стэпы. Жывёльны свет перадгор'яў і нізкагор'яў: грызуны, паўзуны, антылопа джэйран; у гарах — дзік, горны баран (архар), горны казёл, цянь-шаньскі мядзведзь, снежны барс, суркі; з птушак — горны індык, горная курапатка, альпійская галка, вадаплаўныя.



У гарах **Цянь-Шаня**.

Пашавая жывёлагадоўля, земляробства (пераважна ў перадгор'ях і на паліўных землях). Вырошчваюць рыс, вінаград, персікі, яблыкі, абрыкос, слівы, ячмень, пшаніцу, бульбу. Запаведнікі: Ісык-Кульскі, Алмацінскі, Аксу-Джабаглы, Сары-Чэлекскі, Чаткальскі і інш.

В.П.Кісель.



ЦЯНЮ́КАЎШЧЫНА, вёска ў Юраціш-каўскім пассавеце Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл., на р. Якунька. Цэнтр калгаса. За 21 км на ПнУ ад Іўя, 171 км ад Гродна, 2 км ад чыг. ст. Юраціш-кі. 347 ж., 118 двароў (2003). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў і партызан.

ЦЯ́ПІНСКІ (Амельяновіч-Цяпінскі) Васіль Мікалаевіч (1530-я г., Полаччына — 1599 або 1600), бел. пісьменнік, гуманіст, кнігавыдавец. З сям'і гаспадарскага баярына М.Амельяновіча. Імя Ц. ўпершыню ўпамінаецца ў дакумент. актах 1560-х г. У 1557 малодшы афіцэр коннай роты аршанскага старосты Ф.С.*Кміты-Чарнабыльскага*. Удзельнічаў у Інфлянцкай вайне 1558—82. Служыў у падканцлера ВКЛ А.Б.Валовіча. Магчыма, у сваім родавым маёнтку Цяпіна (цяпер Чашніцкі р-н Віцебскай вобл.) заснаваў друкарню, дзе выдаў перакладзенае ім на бел. мову «Евангелле» (каля 1580) з прадмовай — адным з лепшых узораў бел. патрыят. публіцыстыкі 16 ст. (захавалася ў рукапісе). «Евангелле» надрукавана ў 2 слупкі — на царк.-слав. і бел. мовах, са шматлікімі *глосамі* і спасылкамі на літ. крыніцы. Выданне ўпрыгожана разнастайнымі ініцыяламі, наборным арнаментам. Відавочная стылізацыя пад віленскія выданні Ф.*Скарыны* (падабенства шрыфтоў, ініцыялаў) сведчыць пра пераемнасць друкарска-выдавецкіх традыцый. Асн. праграма Ц. разлічана на ўздым нац. культуры, умацаванне грамадскіх пазіцый бел. мовы, абуджэнне актыўнасці, гіст. і нац. свядомасці бел. народа. Як і Скарына, ён лічыў неабходным удасканальваць сістэму школьнай асветы, зрабіць яе больш даступнай, разнастайнай, адпаведнай патрэбам грамадства, у т.л. простым людзям. Гэтай высакароднай мэце ён прысвяціў сваю працу і ахвяраваў значную частку небагатай маёмасці. Патрыятызм Ц. далёкі ад нац. абмежаванасці. Ён з павагай ставіўся да народаў усіх краін, падкрэсліваў гіст., культ. і моўную роднасць слав. народаў. У яго творчасці прысутнічаюць выразныя дэмакр. тэндэнцыі, арыентацыя на ўвесь бел. народ. Дзейнасць Ц. спрыяла зараджэнню, уздыму і кансалідацыі шырокага нац.-культ. і патрыят. руху на Беларусі ў канцы 16 — пач. 17 ст. Ц. цесна супрацоўнічаў з С.*Будным*, часткова падзяляў яго грамадска-паліт. і рэліг. погляды. Удзельнічаў у антытрынітарскіх сінодах 1570-х г., дыспутаваў з прадстаўнікамі радыкальнай Рэфармацыі.

Тв.: Предмова // Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Францыска Скарыны. Мн., 1991.

Літ.: Довнар-Запольский М.В. В.Н.Тяпинский, переводчик на белорусское наречие // Довнар-Запольский М.В. Исследования и статьи. Киев, 1909. Т. 1; Коршунаў А.Ф. Васіль Цяпінскі // Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. Мн., 1968; Галенчанка Г.Я. Васіль Цяпінскі — паслядоўнік скарынінскай справы // 450 год беларускага кнігадрукавання. Мн., 1968; Бабкова В. Васіль Цяпінскі: Новыя дак. // Спадчына. 1991. № 3; Клімаў І.П. Нарыс бібліяграфіі аб Васілю Цяпінскім // Здабыткі: Дак. помнікі на Беларусі. Мн., 1995; Яго ж. Васіль Цяпінскі і яго перакладное «Евангелле» // Весці АН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 1997. № 4.

Г.Я.Галенчанка.

ЦЯПЛІ́НСКІ Марцін [1810?, б. фальварак Крупава (паводле інш. звестак, Цяшэйкава), Зэльвенскі р-н Гродзенскай вобл. — 3.8.1847], бел. паэт, фалькларыст. Пісаў на польскай мове. У 1831—33 у ссылцы на Каўказе, потым жыў на радзіме. Друкаваўся з 1837. У віленскім альманаху «Biruta» («Бірута»), час. «Athenaeum» («Атэнэум»), «Wizerunki i roztrząsania naukowe» («Навуковыя агляды і развагі») змяшчаў рамант. вершаваныя творы, пераклады. Збіраў і выкарыстоўваў у сваёй творчасці бел. паданні, песні, прымаўкі, прыказкі (апавяданне «Штосьці тут сабакам смярдзіць»). Падрыхтаваныя да друку 3 тамы «Паэзіі» засталіся ў рукапісе (не выяўлены). Меркаваў арганізаваць выданне альманаха «Наднёманскі снапок». *У.І.Мархель.*

ЦЯПЛІ́ЦА, збудаванне *ахаванага грунту* са святлопразрыстым пакрыццём са шкла, плёнкі, пластыку для вырошчвання расады, агародніннных, пладовых і дэкар. культур. Паводле ўнутр. будовы і прызначэння адрозніваюць Ц. стэлажныя, або разводачныя (для расады агародніны і кветак) і грунтавыя (для агародніннных і кветкавых культур). Паводле канструкцыі бываюць адназвенныя (ангарныя) і шматзвенныя (блочныя), 1- і 2-схільныя; паводле тэрміну выкарыстання — зімовыя (круглы год) і веснавыя (з лют.— крас. па кастр.); паводле спосабу вырошчвання — глебавыя і гідрапонныя. Абагравание вадзяное, газавае, эл., біял. (біяпаліва). У якасці пажыўнага асяроддзя выкарыстоўваюць гноева-земляныя, тарфагнойныя і торфаперагнойныя *кампосты*, таксама субстраты арган. і мінер. паходжання, забяспечаныя макра- і мікраўгнаеннямі.

ЦЯПЛІ́ЦКІ Юрый Сямёнавіч (н. 13.5.1947, Мінск), бел. фізік. Д-р тэхн. н. (1991). Скончыў БДУ (1969). З 1970 у Ін-це цепла- і масаабмену Нац. АН Беларусі. Навук. працы па гідрадынаміцы і цепламасаабмене ў інфільтравальных дысперсных сістэмах. Развіў тэорыю падобнасці пераносных працэсаў у дысперсных сістэмах, асновы матэм. мадэлявання падоўжнага перамешвання часцінак у калонных апаратах з кіпячым слоем, інж. метады разліку гідрадынамікі і цеплаабмену ў апаратах з інфільтравальнымі дысперснымі сістэмамі.

Тв.: Подобие процессов переноса в неоднородных псевдоожиженных слоях // Инженерно-физ. журнал. 1994. Т. 66, № 1; Перемешивание частиц в циркулирующем кипящем слое (разам з Я.Ф.Ногатавым) // Там жа. 2002. Т. 75, № 3.

ЦЯПЛО́Ў Міхаіл Фёдаравіч (21.11.1918, с. Юрас Пінежскага р-на Архангельскай вобл., Расія — 5.7.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1945). З ліп. 1941 на 2-м Бел. фронце. Камандзір процітанк. гарматы ст. сяржант Ц. вызначыўся 5.7.1944 пры разгроме групоўкі ворага ў Мінскім «катле»: каля в. Раткоўшчына Смалявіцкага р-на Мінскай вобл. разлік яго гарматы ўдзельнічаў у адбіцці 6 контратак праціўніка, знішчыў 2 самаходныя гарматы, 4 кулямёты, 2 аўтамашыны з пяхотай; паранены, застаўшыся адзіным з разліку, падарваў сябе і гітлераўцаў, што абкружылі яго. Імем Ц. названа вуліца і пастаўлены помнік у в. Студзёнка Смалявіцкага р-на.

М.Ф.Цяплоў.

ЦЯПЛУ́ХА, другая назва ракі *Пераволока* ў Камянецкім р-не Брэсцкай вобл. і Польшчы.

ЦЯРЛЕ́ЦКІ (Тарлецкі) Кірыла (свецкае імя невядома, імя па бацьку Сямёнавіч; ?, Піншчына — май 1607), царкоўны дзеяч Рэчы Паспалітай. З правасл. шляхецкага роду ВКЛ. У пач. 1570-х г. пратапоп Пінскай царквы св. Дзмітрыя. У час міжкаралеўя 1574—75 Радай ВКЛ прызначаны епіскапам пінскім і тураўскім, што пацвердзіў прывілеем у 1576 кароль Стафан Баторый. З 1585 епіскап луцкі і астрожскі, з 1589 экзарх (намеснік) канстанцінопальскага патрыярха. У 1590-я г. адзін з ініцыятараў уніі правасл. царквы з каталіцкай у Рэчы Паспалітай. У 1595 разам з І.Пацеем прысягнуў у Рыме рымскаму папу Кліменту VIII. Адзін з арганізатараў царк. сабора ў Брэсце, дзе прынята *Брэсцкая унія 1596*. З 1596 архімандрыт Кобрынскага Спаскага манастыра, з 1597 — Жыдзічанскага (каля Луцка).

ЦЯРНО́ПАЛЬ, горад, цэнтр Цярнопальскай вобл. Украіны, на р. Серэт (бас. р. Днестр). Вядомы з 1540. Да 1944 наз. Тарнопаль. 234 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: лёгкая (баваўняная, галантарэйная), харч. (мясная, малочная, цукр.), машынабудаванне і металаапрацоўка (камбайны, асвятляльныя і радыёпрылады), мэблевая, фармацэўтычная; выт-сць буд. матэрыялаў, фарфоравых

вырабаў. З ВНУ. Драм. тэатр, філармонія. Краязнаўчы музей (з карціннай галерэяй). Арх. помнікі: Стары замак (1540—48); цэрквы Васкрасенская (17 ст.), Раства (1602—08); дамініканскі касцёл (18 ст.).

ЦЯРНО́ПАЛЬСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ. Размешчана на З Украіны. Утворана 4.12.1939. Пл. 13,8 тыс. км^2. Нас. 1146,2 тыс. чал. (2001), гарадскога 41%. Цэнтр — г. *Цярнопаль*. Найб. гарады: Чарткоў, Крэменец, Бережаны.

Большая ч. тэр. ў межах Падольскага ўзв. (выш. да 443 м). На Пн яго Варанякі і Крамянецкія горы, з ПнЗ на ПдУ цягнуцца вапняковыя грады Толтры, на крайнім ПдЗ — Аполле. Пашыраны карставыя формы рэльефу. Карысныя выкапні: мінер. буд. матэрыялы (вапнякі, гліны, кварцавыя пяскі, мел, мергель), торф, буры вугаль, фасфарыты; крыніцы мінер. вод. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. -5 °С, ліп. 19 °С, ападкаў 520—700 мм за год. Гал рэкі — Днестр з прытокамі Залатая Ліпа, Стрыпа, Серэт, Збруч; на Пн — Вілія, Іква, Гарынь (бас. р. Прыпяць). Глебы пераважна чарназёмныя, на Пн — дзярновыя і балотныя. Пад лесам каля 14% тэр.; пашыраны шыракалістыя лясы (дуб, граб, ясень, вяз, ліпа), на Пн — хваёвыя і хваёва-дубовыя лясы.

Асн. галіны прам-сці — харч. (цукр., мясная, малочная, масласыраробная, алейная, агароднінакансервавая, спіртавая, тытунёвая), лёгкая (тэкст., абуткovая, галантарэйная), машынабудаванне і металаапрацоўка (буракаўборачныя камбайны, свяцільні, пускарэгулявальныя апараты і інш.), дрэваапр., у т.л. мэблевая. Вытв-сць буд. матэрыялаў, фарфору, шкла, пластмас. Развіты маст. промыслы (ткацтва, вышыўка, лазапляценне, вытв-сць дываноў). Сельская гаспадарка спецыялізуецца на вырошчванні збожжавых, цукр. буракоў, мяса-малочнай жывёлагадоўлі. Пл. с.-г. угоддзяў 1060 тыс. га. Асушана каля 120 тыс. га. Пасяўная пл. ў 2000 склала 794 тыс. га. Гал. збожжавыя культуры — пшаніца, ячмень, кукуруза, грэчка; тэхн. — цукр. буракі, тытунь; кармавыя — люцэрна, канюшына, кармавыя караняплоды. Бульбаводства, агародніцтва, садоўніцтва. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней, авечак і коз, птушак. Сажалкавае рыбаводства. Пчалярства. Даўж. чыгунак 574 км, аўтадарог з цвёрдым пакрыццём каля 5 тыс. км. Гал. чыгункі Кіеў—Жмерынка—Цярнопаль—Львоў—Чоп, Кіеў—Шапятоўка—Цярнопаль—Чарнаўцы, аўтамагістралі Брэст—Цярнопаль—Чарнаўцы, Львоў—Цярнопаль—Хмяльніцкі. Суднаходства па р. Днестр.



ЦЯРО́ХІН Станіслаў Фёдаравіч (н. 4.10.1929, г. Яраслаўль, Расія), бел. этнограф, гісторык. Скончыў БДУ (1965). З 1957 працаваў у мед. установе на Брэстчыне, у друку, на кінастудыі «Беларусьфільм». З 1971 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нац. АН Беларусі. Даследуе матэрыяльную і духоўную культуру беларусаў. Саўтар кніг «Бортніцтва на Беларусі» (1980) і «Занятак спрадвеку высакародны» (1987, абедзве з У.Гурковым). Аўтар раздзелаў у калект. зб-ках і манаграфіях «Пытанні этнаграфіі і фальклярыстыкі», «Помнікі народнай архітэктуры і побыту Беларусі» (абедзве 1979), «Этнаграфія Беларусі» (1980), «Помнікі этнаграфіі» (1981), «Промыслы і рамёствы Беларусі» (1984), «Грамадскі, сямейны побыт і духоўная культура насельніцтва Палесся» (1987), «Святы і абрады ў Беларускай ССР» і «Палессе: Матэрыяльная культура» (абодва 1988).

Тв.: Охота в Белоруссии. Мн., 1986; Мядовы бунт. Мн., 1987; У фокусе канкрэтнага факта: Праўда і мана пра ап'яняльныя напіткі. Мн., 1988; Славутыя адвагай на вайне. Мн., 1991; Перунова цяпельца. Мн., 1993; Многія прыйдуць пад імем маім. Мн., 1995.

ЦЯРПЕ́ННЯ ЗАЛІЎ. У Ахоцкім м., каля паўд.-ўсх. ўзбярэжжа в-ва Сахалін, з Пн часткова абмежаваны п-вам *Цярпення*. Даўж. 65 км, шыр. каля 130 км, глыб. да 50 м. Упадае р. Паранай. Прылівы няправільныя, паўсутачныя (да 1,5 м). Зімой замярзае. Рыбалоўства. Порт — Паранайск. Адкрыты і названы ў 1643 мараплаўцам М.Г. дэ Фрызам, які чакаў там, пакуль скончыцца працяглы густы туман.

ЦЯРПЕ́ННЯ ПАЎВО́СТРАЎ, частка ўсх. ўзбярэжжа в-ва Сахалін, у Сахалінскай вобл. Расіі. Выступае на 65 км у Ахоцкае м., заканчваецца аднайм. мысам шыр. да 20 км, у перашыйку Лодачны менш за 1 км. Выш. да 350 м. Абмываецца на З *Цярпення заліў*.

ЦЯРЭ́НІН Аляксандр Мікалаевіч (6.5.1896, г. Калуга, Расія — 18.1.1967), расійскі фізікахімік; заснавальнік рас. навук. школы фотахімікаў. Акад. АН СССР (1939, чл.-кар. 1932). Герой Сац. Працы (1966). Скончыў Петраградскі ун-т (1922), з 1919 у Дзярж. аптычным ін-це (у 1945—56 навук. кіраўнік), адначасова з 1922 у Ленінградскім ун-це (з 1932 праф.). Асн. працы па вывучэнні дзеяння святла на элементарныя сістэмы ад атамаў да біямалекулярных утварэнняў. Растлумачыў прыроду фасфарасцэнтнага стану арган. злучэнняў (1943). Дзярж. прэмія СССР 1946.

Тв.: Избр. труды. Т. 1—3. М., 1972—75.

ЦЯРЭ́НІЧЫ, вёска ў Гомельскім р-не, на р. Уза, каля аўтадарогі Гомель—Жлобін. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 31 км на ПнЗ ад Гомеля. 567 ж., 216 двароў (2003). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Царква. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЦЯРЭ́НЦЬЕЎ Авянір Апанасавіч (н. 5.12.1938, г. Вялікія Лукі, Расія), бел. вучоны ў галіне фізікахіміі торфу. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1996), д-р тэхн. н. (1990), праф. (1991). Скончыў Маскоўскі тарфяны ін-т (1961). З 1974 у Ін-це праблем выкарыстання прыродных рэсурсаў і экалогіі Нац. АН Беларусі (у 1990—2001 нам. дырэктара). Навук. працы па фіз.-хім. механіцы прыродных дысперсных сістэм і горных парод. Распрацаваў тэарэт. асновы і спосабы накіраванага структураўтварэння ў тарфах і сапрапелях, тарфяна-балотных глебах, бурых вугалях, кампазіцыях на аснове торфу для атрымання розных матэрыялаў і паліва. Выявіў механізм рэзкага памяншэння вільгацеправоднасці і рухомасці катыёнаў у тарфяных сістэмах пры ўвядзенні аніённых паверхнева-актыўных рэчываў. Абгрунтаваў магчымасць павелічэння адгезійных сувязей у тарфавугальнай кампазіцыі за кошт убудоўвання гумінавых рэчываў торфу ў структуру паверхневых слаёў вугалю пры яго механаактывацыі.

Тв.: Физико-химические основы технологии торфяного производства. Мн., 1983 (у сааўт.); Физика и химия торфа. М., 1989 (у сааўт.).

ЦЯРЭ́НЦЬЕЎ Валянцін Міхайлавіч (7.4.1907, г. Веліж Смаленскай вобл., Расія — 14.12.1983), бел. вучоны ў галіне фізіялогіі раслін. Д-р біял. н. (1959), праф. (1962). Скончыў БСГА (1937). З 1945 у Ін-це эксперым. батанікі АН Беларусі (з 1954 заг. аддзела, з 1970 заг. лабараторыі). Навук. працы па абмене рэчываў, росце, развіцці і фарміраванні мех. тканак раслін. Даследаваў уздзеянне воднага і светлавога рэжымаў, мінер. жыўлення на жыццёвыя праяўленні раслін. арганізма на тарфяной глебе і іонаабменных субстратах ва ўмовах

штучнага асяроддзя. Дзярж. прэмія Беларусі 1980.

Тв.: Аб паветраным і мінеральным жыўленні раслін. Мн., 1953 (разам з Ц.М.Годневым); Особенности физиологии роста хлебных злаков на торфяной почве. Мн., 1970; Вырошчванне капусты Хібінскай у працяглай манакультуры на іанітнай глебе (разам з Т.П.Суровай, Л.Л.Кошалевай) // Весці АН БССР. Сер. біял. навук. 1970. № 6; Физиология устойчивости растений к полеганию и методы ее оценки // Физиология растений в помощь селекции. М., 1974. *М.А.Ламан.*

ЦЯРЭ́ШКАВІЧЫ, вёска ў Гомельскім р-не, пры ўпадзенні р. Вуць у Сож. Цэнтр сельсавета і унітарнага с.-г. вытв. прадпрыемства. За 20 км на Пд ад Гомеля. 1842 ж., 606 двароў (2003). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЦЯРЭ́ШЧАНКА Кузьма Юр'евіч (кастр. 1888, в. Замосцішча Смаленскай вобл., Расія — 12.3.1922), дзеяч бел. нац. руху. Скончыў Маскоўскі с.-г. ін-т (1912). З

А.М.Цярэнін.

А.А.Цярэнцьеў.

К.Ю.Цярэшчанка.

1906 прыхільнік партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. У 1-ю сусв. вайну ў арміі. У 1917 адзін з ініцыятараў стварэння і старшыня Пскоўскай бел. рады. Дэлегат з'езда беларусаў-вайскоўцаў Паўн. фронту ў Віцебску (ліст. 1917), *Усебеларускага з'езда 1917* у Мінску. Восенню 1918 кааптаваны ў *Віленскую беларускую раду* (ВБР). Паводле ўмоў перагавораў (15.11 — 8.12.1918) паміж ВБР і *Літоўскай тарыбай*, у аснове якіх ляжала ідэя стварэння Бел.-Літ. дзяржавы, прызначаны нач. Гродзенскага пав., потым прадстаўніком Літ. тарыбы ў Ваўкавыскім пав. Адначасова з ліст. 1918 в.а. кіраўніка Мін-ва ўнутр. спраў БНР. Супрацоўнічаў з Гродзенскім падп. к-там РКП(б), вёў арганізац. працу па стварэнні Бел. партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р). Са студз. 1919 камісар Мін-ва бел. спраў Літ. тарыбы ў Беластоку і Гродне; удзельнік клуба «Беларуская хатка» ў Гродне, чл. Цэнтр. бел. рады Гродзеншчыны. З лют. 1919 сакратар замежных спраў БНР, з сак. 1919 міністр унутр. спраў ва ўрадзе А.Луцкевіча. На Бел. з'ездзе Віленшчыны і Гродзеншчыны (чэрв. 1919) абраны ў склад *Цэнтральнай беларускай рады Віленшчыны і Гродзеншчыны*. З лета 1919 дыпламатычны прадстаўнік БНР у Латвіі і Эстоніі. Пасля вяртання ў Вільню арыштаваны польскімі ўладамі. З вер. 1919 у Мінску, старшыня *Часовага беларускага нацыянальнага камітэта*. Са снеж. 1919 чл. прэзідыума Найвышэйшай рады БНР, але ў хуткім часе падаў у адстаўку з пасады міністра ўнутр. спраў БНР і выключаны з БПС-Р. Адзін з ініцыятараў стварэння ў студз. 1920 Цэнтр. бел. саюза сельскай гаспадаркі (Цэнтрабелсаюза). У час наступлення сав. войск у ліп. 1920 разам з Б.Тарашкевічам і В.Іваноўскім эвакуіраваўся ў Варшаву. З восені 1920 старшыня Цэнтр. бел. нац. к-та, чл. рэвіз. камісіі «Саюза спажывецкіх кааператываў Гарадзеншчыны». На нац.-паліт. нарадзе 1920 у Рызе ад імя Найвышэйшай рады БНР самавольна склаў паўнамоцтвы апошняй і прызнаў урад В.Ластоўскага. З пач. 1921 у Вільні, адзін з заснавальнікаў Саюза сельскай гаспадаркі на Віленшчыне. Пазней пераехаў у БССР, працаваў у Мінску на адказных пасадах у Цэнтрабелсаюзе.

У.В.Ляхоўскі, А.М.Чарнякевіч.

ЦЯРЭ́ШЧАНКА Мікола (Мікалай Іванавіч; 13.9.1898, с. Шчарбінаўка Залатаношскага р-на Чаркаскай вобл., Украіна — 30.5.1966), украінскі паэт, перакладчык. Вучыўся ў Кіеўскім політэхн. ін-це (1917—22). Друкаваўся з 1918. У зб-ках вершаў «Лабараторыя» (1924), «Краіна працы» (1928), «Натхненне» (1932), «Паэмы» (1935) і інш. тэмы тагачаснай рэчаіснасці. Гераізму народа ў барацьбе супраць фашызму прысвечаны зб-кі «Дзяўчына з Украіны» (1942), «Зоркі» (1944). Мірная праца людзей — тэма паэт. зб-каў «Жніво» (1946), «Шчодрая зямля» (1956), «Сэрца людское» (1962) і інш. Пераклаў на ўкр. мову паэмы Я.Купалы «Курган», «Нікому», «Над ракою Арэсай», «Тарасова доля», вершы і інш. На ўкр. мове пад яго рэд. выйшла кн. Я.Купалы «Выбранае» (1947).

Тв.: Твори. Т. 1—2. Київ, 1968; Рус. пер. — Стихи. М., 1933; Радуги-дороги. М., 1959.

ЦЯСА́К, сякучая і колючая халодная зброя з кароткім (64—72 см) шырокім (прамым або скрыўленым) двухбаковавострым або адналязовым клінком і эфесам (рукаяткай з крыжавінай або дужкай). Насілі яго ў ножнах на плечавым рамяні. У войску ВКЛ быў на ўзбраенні ў жаўнераў пяхоты і артылерыі да канца 18 ст. У рас. арміі з 2-й пал. 18 ст. да сярэдзіны 19 ст. быў на ўзбраенні пяхоты, артылерыі і інж. войск. У некат. сучасных арміях ёсць *штыкі* ў выглядзе Ц.

ЦЯСЕ́ВІЧ Платон Іванавіч (7.12.1879, в. Нягневічы Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. — 30.11.1958), расійскі спявак (бас). Нар. арт. Расіі (1947). З 1904 выступаў як оперны спявак, з 1915 саліст т-раў Вял. і Зіміна ў Маскве. У 1918—48 гастраліраваў, у т.л. на Беларусі, спяваў у оперных т-рах Францыі і Італіі (1925—26, 1932). Валодаў магутным голасам шырокага дыяпазону і прыгожага тэмбру. Сярод партый: Барыс Гадуноў («Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага), Качубей («Мазепа» П.Чайкоўскага), Млынар («Русалка» А.Даргамыжскага), Сусанін («Іван Сусанін» М.Глінкі), Дон Базіліо («Севільскі цырульнік» Дж. Расіні) і інш. У канцэртным рэпертуары рамансы рас. і замежных кампазітараў.

ЦЯСЛА́, дрэваапрацоўчая прылада, якая выкарыстоўвалася ў даўбёжным рамястве пры вырабе карытападобных форм і ў цяслярстве. Архаічная форма Ц. вядома з часоў неаліту (завостраны камень з лязом накшталт матыкі, перпендыкулярна пастаўленым да драўлянай ручкі). У тыповым варыянце складаецца з жал. стрыжня з авальным завостраным лязом і драўлянай ручкі, замацаванай у правушыне. Другая разнавіднасць — Ц. ўтульчатая; яна завяршалася конусападобным раструбам-утулкай, у якой замацоўвалася кручкападобная ручка. Ц. адрозніваліся памерамі, авалам ляза, вуглом нахілу стрыжня да ручкі.

В.С.Цітоў.

ЦЯСЛЮ́К Уладзімір Паўлавіч (25.10.1913, Мінск — 22.1.1977), бел. кінааператар і рэжысёр. Засл. дз. маст. Беларусі (1964). Скончыў Маскоўскі тэхнікум цыркавога мастацтва (1932). З 1933 на кінастудыі «Савецкая Беларусь» у Ленінградзе, з 1935 на Мінскай студыі кінахронікі. У Вял. Айч. вайну франтавы аператар: удзельнічаў у здымках фільмаў «Дзень вайны» (1942), «Вызваленне Савецкай Беларусі» (1944) і інш.; яго кадры выкарыстаны ў кінаэпапеі «Вялікая Айчынная» (1979). З 1946 на кінастудыі «Беларусьфільм». Здымаў хроніку, дакумент. і навук.-папулярныя фільмы. Аператар фільмаў «Шчасце народа» (1949), «Народны паэт» (1952), «Кастусь Калі-



а

б

Цесакі: а — сапёрны ўзору 1824; б — артылерыйскі ўзору 1834.

ноўскі», «Магілы не маўчаць» (абодва 1963), «Птушка «ікс» (1972) і інш. Выступаў як рэжысёр: «Сустрэча герояў Брэста» (1961, з У. Шэлегам), «Штрыхі да партрэта» (1968, з І.Пікманам і Р.Ясінскім), «Край крынічны» (1972). Рэжысёр-аператар фільмаў «Балгарскія сустрэчы» (1961), «Па дарогах Беларусі» (1967), «У добры шлях» (1969), «Паўстагоддзя ў кіно» (1971) і інш. *В.І.Смаль.*

ЦЯСЛЯ́РНЫЯ РАБО́ТЫ, будаўнічыя работы па вырабе і ўстаноўцы драўляных канструкцый і дэталей. Характарызуюцца менш дакладнай (у адрозненне ад *сталярных работ*) апрацоўкай вырабаў з драўніны.

Да Ц.р. адносяцца работы па ўзвядзенні драўляных фундаментаў (паляў), сцен, перагародак, падлог, элементаў каркасаў і перакрыццяў будынкаў, дахаў, а таксама па вырабе драўляных канструкцый інж. збудаванняў (мастоў, плацін, эстакад, горных мацаванняў), дапаможных прыстасаванняў (буд. рыштаванняў, апалубкі і інш.), па зборцы шчытавых дамоў і г.д. Пры Ц.р. выкарыстоўваюць дыскавыя электрапілы, электрасвердлы, інш. *дрэварэзальны інструмент, ручныя машыны* (гл. *Сталярна-цяслярскі інструмент*). Элементы канструкцый злучаюць паміж сабой пераважна ўрубкамі, спец. стрыжнямі (нагелямі), цвікамі і водатрывалымі клямі. Даўгавечнасць драўляных вырабаў і канструкцый павышаюць апрацоўкай *антысептычнымі сродкамі* і *інсектыцыдамі*, нанясеннем вогнеахоўных пакрыццяў.

Літ.: Крейндлин Л.Н. Плотничные работы. 4 изд. М., 1985.

ЦЯСЛЯ́РСТВА, адзін з відаў дрэваапрацоўчых рамёстваў, звязаны з вырабам і ўстаноўкай драўляных канструкцый і дэталей вял. памераў; галіна *народнага дойлідства*. Вядома многім народам свету. Да Ц. адносяцца *цяслярныя работы* па ўстаноўцы драўляных падмуркаў, сцен, падлогі, перагародак, перакрыццяў (бэлек, насцілаў), даху (крокваў, лат), дапаможных канструкцый (рыштаванняў, памостаў) і інш. На Беларусі матэрыял для Ц. — драўніна пераважна хваёвых парод у выглядзе бярвён, брусоў, дошак, жэрдак, у наш час — таксама фанеры, драўнянавалакністых пліт і інш. Асн. віды апрацоўкі драўніны ў Ц. — рубка, абчэсванне, распілоўка, габляванне, свідраванне, дзяўбанне і інш.; асн. дрэваапр. інструменты — сякеры, пілы, долаты, свердлы, рубанкі і інш. (гл. *Сталярна-цяслярскі інструмент*).

У нар. дойлідстве бярвёны рубілі пераважна сякерамі, для насцілаў (цёсу) іх расколвалі ўздоўж на плахі, пры гэтым побач з сякерай выкарыстоўвалі і драўляныя клíны. З 19 ст. пашырылася піла, з дапамогай якой нарыхтоўвалі дошкі, аполкі, брусы, рабілі мацаванні вуглоў зруба і інш. Бярвенне для зруба абчэсвалі з 2 бакоў (Цэнтр. і Зах. Беларусь), канструкцыі мацавалі ўрубкай з дапамогай драўляных калкоў, забітых у прасвідраваныя адтуліны і інш. З канца 19 ст. Ц. нярэдка мела характар *адыходніцтва*. У сучасным нар. дойлідстве апрацоўка драўніны, нарыхтоўка дошак, выраб асн. канструкцый ажыццяўляюцца мех. спосабам на піларамах з ужываннем інструментаў з электрапрыводам. Выпрацаваныя нар. майстрамі-цеслярамі навыкі і прыёмы шырока выкарыстоўваюцца ў сучасным грамадскім і прамысл. буд-ве. Гл. таксама *Сталярства*. *Я.М.Сахута.*

ЦЯСНІ́НА, вузкая глыбокая даліна са стромкімі схіламі, выпрацаваная ракой у цвёрдых карэнных горных пародах або лёсах. Акрамя эразійнага, могуць мець тэктанічнае ці карставае паходжанне. Трапляюцца пераважна ў гарах, маюць V-падобную форму, часам схілы навісаюць над дном; глыб. ад некалькіх дзесяткаў або сотняў метраў да 1 км і больш. Нярэдка выкарыстоўваюцца для буд-ва ГЭС (напр., на р. Вахш у Таджыкістане).

Чэгемская **цясніна** на Каўказе.

ЦЯСО́ВА, вёска ў Пагосцінскім с/с Салігорскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса. За 12 км на ПнУ ад Салігорска, 130 км ад Мінска, 3 км ад Салігорскага вадасховішча. 737 ж., 334 двары (2003). Базавая школа-сад, Дом культуры, б-ка. Магіла сав. воіна. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЦЯ́ТНА, возера ў Верхнядзвінскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Ужыца (выцякае з возера), за 2 км на У ад в. Дубровы, за 32 км на ПнУ ад г. Верхнядзвінск. Пл. 1,2 км^2, даўж. 1,9 км, найб. шыр. 1,2 км, найб. глыб. 7,1 м. Пл. вадазбору 20,5 км^2. Катлавіна авальнай формы, выцягнута з Пн на Пд.. Схілы катлавіны выш. 5—7 м, пад лесам і хмызняком. Берагі нізкія, забалочаныя і парослыя хмызняком. Упадае некалькі ручаёў.

ЦЯЎЛО́ЎСКІ Міхаіл Дамінікавіч (н. 29.9.1930, Мінск), бел. вучоны ў галіне тэхналогіі радыёэлектроннай апаратуры. Д-р тэхн. н. (1989), праф. (1991). Засл. дз. нав. Беларусі (1995). Скончыў БПІ (1959). З 1959 у Бел. ін-це механізацыі сельскай гаспадаркі, з 1964 у Фізікатэхн. ін-це АН Беларусі. З 1967 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі. Навук. працы па праблемах энерга- і рэсурсазберагальных тэхналогій для радыёэлектронікі і прыладабудавання, тэарэт. асновах мікраміняцюрызацыі радыёэлектронных вырабаў і інш.

Тв.: Ультразвуковая очистка РЭА и приборов. Мн., 1984 (разам з Я.П.Фастаўцом, В.М.Алефірэнкам); Ультразвуковая пайка в радио и приборостроении. Мн., 1985 (разам з У.У.Клубовічам, У.Л.Лапіным). *М.П.Савік.*

ЦЯХА́НАЎСКАЕ ВАЯВО́ДСТВА (Wojewódzwo Ciechanowskie), былая адм.-тэр. адзінка ў цэнтр. ч. Польшчы. З 1999 у складзе *Мазавецкага ваяводства*.

ЦЯХЦІ́Н, вёска ў Бялыніцкім р-не Магілёўскай вобл., на правым беразе р. Друць. Цэнтр сельсавета і унітарнага камунальнага с.-г. прадпрыемства. За 20 км на Пд ад г. Бялынічы, 65 км ад Магілёва, 20 км ад чыг. ст. Друць. 904 ж., 358 двароў (2003). Лясніцтва. Сярэдняя школа-сад, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Свята-Мікольская царква. Брацкая магіла партызан. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Каля вёскі група археал. помнікаў эпохі неаліту.

ЦЯЦЕ́РА (сапр. Маржкоўскі ці Мержкоўскі) Павел Іванавіч (? — каля 1670), дзяржаўны дзеяч Украіны. Валынскі шляхціц, прыбліжаны (пазней зяць) Б.*Хмяльніцкага*. Удзельнік вызв. вайны 1648—54 супраць польскага панавання. Выступаў супраць далучэння Украіны да Расіі, удзельнічаў у падпісанні ўкр.-польскага *Гадзяцкага дагавора 1658*. Пасля вымушанай адмовы ад улады Ю.Хмяльніцкага (сын Б.Хмяльніцкага, гетман Украіны ў 1659—63) абвясціў сябе гетманам Правабярэжнай Украіны (1663—65). Са сваімі казацкімі палкамі далучыўся да паходу польскіх войск на Левабярэжную Украіну (1663—64), разам з палякамі падаўляў нар. хваляванні 1663—65 на Правабярэжнай Украіне. У 1665 пад націскам паўстанцаў уцёк у Польшчу.

ЦЯЦЕ́РКІ, вёска ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., на аўтадарозе Браслаў—Шаркаўшчына. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 20 км на ПдУ ад г. Браслаў, 235 км ад Віцебска, 28 км ад чыг. ст. Шаркаўшчына. 243 ж., 93 двары (2003). Пач. школа, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЦЯЦЕ́РСКІ Міхаіл Іванавіч (? — 12.9.1797), бел. і польскі драматург, педагог. Выкладаў рыторыку ў Забельскім дамініканскім калегіуме (Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл.), дзе разам з К.Марашэўскім і Ю.Юрэвічам стварыў *За-*

бельскі школьны тэатр. Для яго перарабіў камедыю Мальера «Лекар паняволі» («Доктар па прымусу», 1787); увёў туды вобразы бел. сялян Хведара і Апанаса, сцэны з якімі нагадваюць традыц. бел. інтэрмедыі, мальераўскі сюжэт напоўніў бел. мясц. каларытам. Трагедыі «Сапар» (1788), «Фемістокл» (1790, абедзве на польскай мове) напісаны на сюжэты з ант. гісторыі ў адпаведнасці з эстэтыкай класіцызму. Камедыі «Шлюб, пастаўлены дагары нагамі штучкамі арлекіна» і «Камедыя» (абедзве 1790—91, на польскай мове) выкрываюць маральныя заганы бел. феад. грамадства. Аўтар лібрэта оперы «Апалон-заканадаўца, або Рэфармаваны Парнас» (1789) і, як лічаць, арацыі «Пчолы» (1790, абедзве на польскай мове), якія ставіліся ў т-ры, падручніка па рыторыцы (на лац. мове, рукапіс у б-цы Вільнюскага ун-та).

Тв.: Доктар па прымусу // Беларуская дакастрычніцкая драматургія. Мн., 1978.

Літ.: Гісторыя беларускага тэатра. Т.1. Мн., 1983. *А.В.Мальдзіс.*

ЦЯЦЕ́РСКІ Фаўстын Іванавіч (1760, в. Валынцы ? Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. — 1832 або 1833), бел. грамадскі дзеяч, мемуарыст. Скончыў Віленскі ун-т. Д-р філасофіі і тэалогіі. Настаўнічаў у кляштарных школах, прыёр Віленскага кляштара дамініканцаў. Удзельнік паўстання 1794 на Гродзеншчыне. Пасля яго паражэння стварыў «Віленскую асацыяцыю» для арганізацыі новага паўстання, падтрымліваў сувязі з аднадумцамі-эмігрантамі ў Зах. Еўропе. У 1797 сасланы на пажыццёвую катаргу ў Забайкалле. Амністыраваны і ў 1801 вярнуўся на радзіму. З 1801 прыёр Забельскага кляштара дамініканцаў, да 1816 выкладчык Забельскага дамініканскага калегіума. Яго «Успаміны» — адно з першых этнагр. апісанняў Даурыі (апубл. на польск. мове ў 1865 у Львове А.Бялеўскім, рукапіс захоўваецца ў б-цы АН Літвы). У іх паказаны побыт карэннага насельніцтва Сібіры, каларытныя партрэты катаржнікаў і ссыльных, выхадцаў з Беларусі, крытыкуецца царскае чыноўніцтва і правасл. духавенства. У 1821—32 візітатар школ у Беларусі і Літве. У «Дзённіку візітатара» (1904) апісаў свае паездкі, змясціў звесткі па гісторыі выяўл. мастацтва і архітэктуры, пра норавы феад. грамадства. Рукапіс яго «Дзённіка падарожжа» па кляштарах Беларусі захоўваецца ў б-цы Віленскага ун-та. Працы Ц. па гісторыі і філасофіі Беларусі і Літвы пад назвай «Літоўская хроніка» загінулі.

Тв.: Znaczniejszych przypadków pewnego z Syberii powrotnego Polaka w 1801 roku. Warszawa; Wrocław, 1998.

Літ.: Мальдзіс А. Таямніцы старажытных сховішчаў. Мн., 1974; Географы і падарожнікі Беларусі: [Альбом-атлас]. Мн., 1999. *А.В.Мальдзіс, В.А.Ярмоленка.*

ЦЯЦЕ́РСКІ Фелікс (1774—1826), бел. і польскі літаратар, навуковец, педагог. Д-р філасофіі і тэалогіі Віленскага ун-та. Вывучаў філасофію, вышэйшую матэматыку, фізіку ў Гал. школе ВКЛ (Віленскім ун-це). Выкладаў паэтыку, рыторыку, фізіку ў Забельскім дамініканскім калегіуме (цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл.), у Гродне і Навагрудку. Апошнія гады жыцця правёў у Вільні. Аўтар падручніка па эксперым. фізіцы (1806, на лац. мове). Трактат Ц. аб паэтыцы і рыторыцы страчаны. Вёў канфідэнцыяльныя перагаворы з царом Аляксандрам I адносна прыняцця царом каталіцызму.

Літ.: Мальдзіс А. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мн., 1980.

А.В.Мальдзіс.

ЦЯЦЕ́РЫН, вёска ў Круглянскім р-не Магілёўскай вобл., на паўд. беразе *Цяцерынскага вадасховішча*, каля аўтадарогі Бялынічы—Шклоў. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 9 км на Пд ад г.п. Круглае, 65 км ад Магілёва, 31 км ад чыг. ст. Талачын. 482 ж., 195 двароў (2003). ГЭС. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, паліклініка, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

Упершыню ўпамінаецца ў «Спісе рускіх гарадоў далёкіх і блізкіх» не раней 1387 і не пазней 1406 (паводле датавання М.М.Ціхамірава). У 1430 згадваецца ў акце ўзвядзення Свідрыгайлы на трон ВКЛ. У 1501 аддадзена вял. кн. ВКЛ і польскім каралём *Аляксандрам* у пажыццёвае ўладанне сваёй жонцы *Алене Іванаўне*. У сярэдзіне 16 ст. ў Аршанскім пав., прыватнаўладальніцкае мястэчка. З 1577 цэнтр маёнтка. З 1772 у Рас. імперыі, уладанне графа Салтыкова. У 1848 у Магілёўскім пав., 541 ж., 66 двароў, уласнасць памешчыка. У 1860 — 416 ж., 78 двароў, 3 царквы, яўр. малітоўны дом, бровар. У 1864 адкрыта школа, якая ў 1884 пераўтворана ў нар. вучылішча. У 1897 — 593 ж., 94 двары, пошта, крэдытнае т-ва, фельчарска-акушэрскі пункт, нар. і рамеснае вучылішчы, царк.-прыходская школа, царква, сінагога, крама. У 1926 — 658 ж., 148 двароў. З 1928 вёска. У 1924—31, 1935—59 і з 1966 у Круглянскім, у 1931—35 і ў 1959—66 у Бялыніцкім р-нах. У Вял. Айч. вайну ням. фашысты спалілі 119 двароў, загубілі 188 жыхароў. У 1956 пабудавана гідраэлектрастанцыя. Каля Ц. гарадзішча жал. веку.

А.Г.Шчарбатаў (гісторыя).

ЦЯЦЕ́РЫНСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА. У Круглянскім р-не Магілёўскай вобл., паміж г.п. Круглае і в. *Цяцерын*. Створана ў 1955 плацінай на р. Друць. Пл. 4,6 км^2, даўж. 9,5 км, найб. шыр. 800 м, найб. глыб. 8,8 м, аб'ём вады 8,32 млн. м^3. сярэдні шматгадовы сцёк 166 млн. м^3. Даўж. берагавой лініі 24,6 км. Берагі нізкія. У падводнай ч. катлавіны вылучаюцца верхняя мелкаводная (глыб. 0,5—1,5 м) і ніжняя глыбакаводная (больш за 3 м) часткі. Дно выслана ілам (90%) і торфам. моцна зарастае. Ваганні ўзроўню вады на працягу года 0,9—1,1 м. Выкарыстоўваецца для энергет. мэт (Цяцерынская ГЭС) і рыбагадоўлі.

ЦЯЦЮ́ШНІК (Euphrasia), род кветкавых раслін сям. залознікавых. Каля 200 паліморфных відаў. Пашыраны ва ўмераных паясах абодвух паўшар'яў. На Беларусі 7 відаў. Найб. вядомыя Ц.: драбнакветкавы (E.parviflora), прамастойны (E.stricta, нар. назвы кашэчы сардэчнік, зязюлька, шчыр), Рэйтэра (E.reuteri), фінскі (E.fennica). Трапляюцца на вільготных лугах, узлесках, ускрайках балот.

Адна- і шматгадовыя травы, радзей паўкусты. *Расліны-паўпаразіты*, маюць зялёнае лісце і здольныя да фотасінтэзу. З каранёў інш. раслін (пераважна злакі і асокі) атрымліваюць толькі ваду і мінер. рэчывы з дапамогай

Цяцюшнік лекавы.

каранёвых прысоскаў — *гаўсторыяў*. Лісце супраціўнае, суцэльнае, зубчастае. Кветкі ў верхавінкавых коласа- ці гронкападобных суквеццях, часам адзіночныя. Плод — каробачка. Лек., меданосныя расліны, некат. пустазелле.

ЦЯЧЭ́ННЕ МЫ́СА ГОРН, халоднае паверхневае цячэнне ў Ціхім акіяне, у раёне *Дрэйка праліва*, каля зах. і паўд.-зах. берагоў архіпелага Вогненная Зямля, частка *Заходніх Вятроў цячэння*. Накіравана з З на У з Ціхага ак. ў Атлантычны акіян. Т-ра вады 0—5 °С. Скорасць 0,9—1,8 км/гадз. Расход вады каля 150 млн. м^3/с. Летам нясе айсбергі.

ЦЯЧЭ́ННІ, гл. ў арт. *Марскія цячэнні*.

Ч

Ч, дваццаць шостая літара бел. алфавіта. Паходзіць з кірыліцкай ѱ («чэрв»). У старабел. графіцы ў сувязі з функцыянаваннем розных пісьмовых школ і выкарыстаннем розных тыпаў пісьма (*устаў, паўустаў, скорапіс*) ужывалася ў некалькіх варыянтах, якія дапамагаюць вызначаць час і месца напісання помнікаў. Абазначала гук «ч» («тысяча», «часъ»). Мела лічбавае значэнне «дзевяноста». У 16 ст., акрамя рукапіснай, набыла друкаваную форму. У сучаснай бел. мове абазначае шумны глухі зліткі пярэднеязычны зацвярдзелы зычны гук «ч» («чабор», «чачотка»). Бывае вялікая і малая, мае рукапісную і друкаваную форму. *А.М.Булыка.*

ЧААДА́ЕЎ Пётр Якаўлевіч (7.6.1794, Масква — 26.4.1856), расійскі мысліцель і публіцыст. Унук М.М.*Шчарбатава*. Вучыўся ў Маскоўскім ун-це (1808—11). Удзельнік вайны 1812 і замежных паходаў 1813—14. З 1816 чл. масонскай ложы «З'яднаныя сябры» (з А.С.Грыбаедавым, П.І.Песцелем, С.П.Валконскім, М.І.Мураўёвым-Апосталам), блізкі сябра А.С.Пушкіна. З 1819 чл. «Саюза працвітання», з 1821 — *Паўночнага таварыства дзекабрыстаў*. У 1823—26 падарожнічаў за мяжой, пазнаёміўся з Ф.Шэлінгам і Ф.Ламенэ, рэліг.-філас. ідэі якіх паўплывалі на яго светапогляд. У 1829—31 напісаў свой гал. твор «Філасафічныя пісьмы». Публікацыя першага з іх (1836) успрынята ўладамі як прамая атака на існуючы лад; Ч. быў падвергнуты мед. агляду, імператарскім указам аб'яўлены вар'ятам і назаўсёды пазбаўлены права друкавацца. Паводле Ч., Расія ўспрыняла рэлігію і культуру ад Візантыі, якая знаходзілася па-за Усходам і Захадам, таму засталася па-за гісторыяй сусв. цывілізацыі. Ізаляцыянізму і дзяржаўнасці праваслаўя ў Расіі Ч. супрацьпастаўляў каталіцтва з яго ідэяй усеагульнасці і наддзяржаўнасці. «Філасафічныя пісьмы» стымулявалі палеміку паміж *славянафіламі* і *заходнікамі*, на баку якіх першапачаткова выступаў Ч. У больш позніх творах («Апалогія вар'ята», нап. 1837, і інш.) падкрэсліваў неабходнасць рускім вучыцца ў Еўропы, крытыкаваў і пэўныя адмоўныя бакі еўрап. культуры, а ў духоўным абліччы рус. людзей адкрываў якасці, якія, на яго думку, павінны забяспечыць вял. будучыню Расіі. На думку Ч., асабісты інтарэс і эгаістычныя памкненні вядуць чалавека да зла, а падпарадкаванне агульнаму, суб'ектыўнаму, усечалавечаму пачатку — да маральнага дабра, да ідэальнага грамадскага ладу — «царства Божага на Зямлі».

Тв.: Полн. собр. соч. и избр. письма. Т. 1—2. М., 1991.

Літ.: П.Я.Чаадаев: pro et contra: Антология. СПб., 1998; Лазарев В.В. Чаадаев. М., 1986; Тарасов Б.Н. Чаадаев. 2 изд. М., 1990. *Н.К.Мазоўка.*

ЧАБА́Н Тамара Канстанцінаўна (31.5.1952, в. Чабаны Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. — 20.3.1992), бел. крытык, літ.-знавец. Канд. філал. н. (1982). Скончыла БДУ (1974). Настаўнічала, з 1978 у выд-ве «Навука і тэхніка», з 1981 у Ін-це л-ры АН Беларусі. Даследавала праблемы сучаснага літ. працэсу: манаграфія «Крылы рамантыкі: Рамантычныя тэндэнцыі ў сучаснай беларускай паэзіі» (1982), кн. «Сучасная паэзія і фальклор» (1988, з Я.Гарадніцкім). Складальніца зб-каў «Вобраз» — 86» (1986) і «Зона бяды» (1990). Аўтар творчых партрэтаў, рэцэнзій на кн. бел. паэтаў. *Л.М.Гарэлік.*

ЧАБАНЁНКА Віктар Антонавіч (н. 12.9.1937, с. Елізаветаўка Васільеўскага р-на Запарожскай вобл., Украіна), украінскі моваznавец, лексікограф, літ.-знавец, крытык, паэт. Засл. дз. нав. і тэхн. Украіны (2002). Скончыў Запарожскі пед. ін-т (1959). З 1965 працуе ў Запарожскім ун-це (з 1984 заг. кафедры, у 1985—96 дэкан ф-та). Друкуецца з 1957. Даследуе праблемы лінгвастылістыкі, сацыялінгвістыкі, укр. дыялекталогіі, гісторыі ўкр. мовы, міжслав. моўных і літ. узаемасувязей. У працы «Асновы моўнай экспрэсіі» (1984) аналізуе экспрэсіўна-стыліст. функцыі беларусізмаў ва ўкр. мове. Склаў «Слоўнік гаворак Ніжняй Надняпроўшчыны» (т. 1—4, 1992). Выдаў працу «Вялікі Луг запарожскі: Гісторыка-тапанімічны слоўнік» (1999). Кн. «Славістычныя даследаванні» (2003) пра беларусазнаўчыя зацікаўленасці ўкр. вучоных і бел.-ўкр. літ. сувязі. На ўкр. мову пераклаў вершы М.Багдановіча, Р.Барадуліна, Я.Купалы, А.Лойкі, П.Макаля, П.Панчанкі, М.Танка і інш. Запісвае ўкр. фальклор (зб-кі «Савур-магіла», 1990; «Сястра арлоў», 1991; «Мудрае слова», 1992; «Гартаванае слова», 1995; «Сечавая скарбніца», 1999). У паэт. зб-ках «Сабор душы маёй» (1996), «У вечным змаганні» (2000), «Аратанія» (2001) філас. роздум над гісторыяй Украіны, над праявамі дабра і зла.

Літ.: В.А.Чабаненко: Біобібліогр. покаж. Запоріжжя, 1997. *І.У.Саламевіч.*

ЧАБАНЁНКА Павел Рыгоравіч (н. 15.2.1922, с. Улаклы Вяліканавасёлкаўскага р-на Данецкай вобл., Украіна), бел. дырыжор, педагог. Засл. арт. Беларусі (1968). Скончыў Маскоўскае вышэйшае вучылішча ваен. дырыжораў (1950). З 1950 кіраўнік хар. капэлы, з 1965 дырыжор, з 1968 нач. аркестра штаба БВА, з 1974 выкладаў у Мінскім муз. вучылішчы імя М.Глінкі, з 1976 у Бел. пед. ун-це. Аўтар пераладжэнняў для духавога аркестра твораў С.Рахманінава, Дз. Шастаковіча і інш.

ЧАБАТАРО́Ў Раман Сямёнавіч (15.10.1905, в. Старынка Ушацкага р-на Віцебскай вобл. — 20.5.1981), бел. вучоны ў галіне

Р.С.**Чабатароў**.

паразіталогіі. Акад. АН Беларусі (1961), Акадэміі с.-г. навук Беларусі (1959), д-р вет. н., праф. (1944). Скончыў Віцебскі вет. ін-т (1929). З 1935 у ВНУ Кіева, Свярдлоўска, Львова. У 1959—68 дырэктар Бел. н.-д. вет. ін-та. Навук. пра-

цы па біялогіі ўзбуджальнікаў і пераносчыкаў паразітозаў, гісторыі мед. і вет. паразіталогіі. Распрацаваў методыку вывучэння паразіталагічнай сітуацыі, прапанаваў сістэму мерапрыемстваў па барацьбе з паразітамі с.-г. жывёл і чалавека.

Тв.: Паразітарныя захворванні буйной і дробнай рагатай жывёлы. Мн., 1932; Очерки по истории медицинской и ветеринарной паразитологии (с древнейших времен до конца XIX в.). Мн., 1965; Справочник по ветеринарной и медицинской паразитологии. Мн., 1971; Борьба с паразитозами сельскохозяйственных животных. Мн., 1972.

ЧАБАТО́ВІЧЫ, вёска ў Буда-Кашалёўскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 25 км на ПдЗ ад горада і чыг. ст. Буда-Кашалёва, 40 км ад Гомеля. 392 ж., 163 двары (2003). Дрэваапр. прадпрыемства. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. У цэнтры вёскі курганны могільнік (10—12 ст.).

ЧАБАЧО́К АМУ́РСКІ (Pseudorasbora parva), рыба сям. карпавых атр. карпападобных. Пашырана ў бас. Амура, у Кітаі, Карэі, Японіі, на Тайвані; сустракаецца таксама ў сажалкавых гаспадарках Еўропы і Сярэдняй Азіі.

Даўж. да 11 см. На целе буйная луска, у верхняй ч. цела на лускавінках цёмны абадок. Уздоўж бакоў цела вузкая цёмная паласа. Рот маленькі, верхні, папярочны. Корміцца ракападобнымі і лічынкамі хіранамід.

Чабачок амурскі.

ЧАБО́Р (Thymus), род кветкавых раслін сям. ясноткавых. Каля 150 (паводле інш. звестак 400) відаў. Пашыраны ва ўмераным поясе Еўразіі і ў Паўн. Афрыцы. Некалькі відаў, асабліва Ч. звычайны (Th. vulgaris), вырошчваюць як эфіраалейныя і лек. культуры ў краінах Еўропы і Амерыкі. На Беларусі 3 віды Ч.: блышыны (Th.pulegioides), паўзучы, або звычайны, ці багародская трава (Th. serpyllum, нар. назвы цымбер, цэбрык, калатовічкі), Маршала (Th.marschallianus). Трапляюцца на пясчаных схілах, у хмызняках, узлесках, уздоўж дарог.

Нізкія кусцікі і паўкусцікі з паўзучымі прыўзнятымі дравяністымі сцёбламі. Лісце супраціўнае, суцэльнае, чаранковае або сядзячае. Кветкі дробныя, у несапраўдных калъчаках, сабраныя ў галоўчатыя ці коласападобныя суквецці. Плод — арэшак. З лісця Ч. атрымліваюць эфірны алей, які выкарыстоўваюць у медыцыне, парфумерыі і харч. прам-сці. Лек., тэхн., харч. расліны.

ЧАБО́Р Янка (сапр. Патаповіч Іван Сцяпанавіч; 11.7.1911, в. Рачканы Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл. — 1943), бел. пісьменнік. Скончыў Віленскую бел. гімназію (1931), вучыўся ў Віленскім ун-це. Удзельнік нац.-вызв. барацьбы ў Зах. Беларусі. Адзін з ініцыятараў стварэння *Літаратурнага фронту сялянска-рабочых пісьменнікаў*; на з'ездзе пісьменнікаў у 1933 абраны рэдактарам-выдаўцом час. *«Літаратурная старонка»*. У 1934 асуджаны на 5 гадоў зняволення, у 1936 амнісціраваны. Пасля ўз'яднання Зах. Беларусі (1939) прымаў удзел ва ўстанаўленні сав. улады і ў рабоце першых сав. устаноў. Друкаваўся з 1928. Пісаў вершы публіцыстычнага і маральна-выхаваўчага характару. Месца і абставіны смерці нявысветленыя.

Тв.: У кн.: Сцягі і паходні. Мн., 1965.

Літ.: Міско Я. Хлопец з вёскі Рачканы // Міско Я. Маё маўклівае сэрца. Мн., 1983.

У.А.Лебедзеў.

ЧАБУКІ́ЯНІ Вахтанг Міхайлавіч (12.3.1910, Тбілісі — 6.4.1992), грузінскі і рас. артыст балета, балетмайстар, педагог. Нар. арт. СССР (1950), Герой Сац. Працы (1990). Скончыў балетную студыю М.Перыні (1924). З 1929 артыст Ленінградскага т-ра оперы і балета імя С.М.Кірава. У 1941—73 гал. балетмайстар, саліст (да 1968) Груз. т-ра оперы і балета. Адначасова ў 1950—73 выкладчык і маст. кіраўнік Тбіліскага харэаграфічнага вучылішча, у 1960—70 у Тэатр. ін-це імя Ш.Руставелі. Танцоўшчык гераічнага плана, валодаў рэдкімі прыроднымі данымі і віртуознай тэхнікай. Выканаў партыі: Зігфрыд («Лебядзінае возера» П.Чайкоўскага), Салор, Базіль («Баядэрка», «Дон Кіхот» Л.Мінкуса), Жэром («Полымя Парыжа» Б.Асаф'ева), Альберт, Раб («Жызэль», «Карсар» А.Адана) і інш. Абагульніў традыцыі класічнага балета і груз. танц. мастацтва, стварыў асаблівы стыль сцэн. танца. Паставіў балеты «Сэрца гор» А.Баланчывадзе (1938), «Лаўрэнсія» А.Крэйна (1939), «Сінатле» Р.Кіладзе (1947), «Горда» Д.Тарадзе (1949), «Атэла» А.Мачаварыяні (1957; Ч. — Атэла), «Дэман» С.Цынцадзе (1961), «Гамлет» Р.Габічвадзе (1971), «Апасіяната» Л.Бетховена (1980) і інш., фільмы-балеты. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1948, 1951. Ленінская прэмія 1958.

В.Чабукіяні ў ролі Атэла.

Чабор: 1 — звычайны; 2 — паўзучы.

ЧАБЫШО́Ў Пафнуцій Львовіч (26.5.1821, в. Акатава Калужскай вобл., Расія — 8.12.1894), расійскі матэматык і механік, заснавальнік Пецярбургскай матэм. школы; адзін са стваральнікаў тэорыі канструкцыйных функцый. Акад. С.-Пецярбургскай АН (1856). Скончыў Маскоўскі ун-т (1841). У 1847—82 у С.-Пецярбургскім ун-це (з 1850 праф.). Навук. працы па тэорыі набліжэння функцый мнагаскладамі, інтэгральным злічэнні, тэорыях лікаў, імавернасцей, механізмаў. Даказаў *вялікіх лікаў закон*

П.Л.Чабышоў.

для незалежных выпадковых велічынь з абмежаванай дысперсіяй. Устанавіў заканамернасці размеркавання простых лікаў.

Тв.: Полное собр. соч. Т. 1—5. М.; Л., 1944—51.

Літ.: Прудников В.Е. П.Л.Чебышев, 1821—1894. Л., 1976.

ЧАБЯРУ́К Алена Іванаўна (н. 11.11.1925, ст. Прыяміна Барысаўскага р-на Мінскай вобл.), бел. мовазнавец. Канд. філал. н. (1969). Скончыла БДУ (1951). Працавала настаўніцай, у 1952—91 у Ін-це мовазнаўства АН Беларусі. Даследуе бел. дыялекталогію, балта-слав. моўныя кантакты. Аўтар працы «Лічэбнік у беларускіх гаворках» (1977), сааўтар «Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы» (1963), «Нарысаў па беларускай дыялекталогіі» (1964), «Лінгвістычнай геаграфіі і групоўкі беларускіх гаворак» (1968—69), «Слоўніка беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча» (т. 1—5, 1979—86), «Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак» (т. 1—5, 1993—98; Дзярж. прэмія Беларусі 2000). Дзярж. прэмія СССР 1971 за ўдзел у комплексе прац па бел. лінгвагеаграфіі.

ЧАВА́КІНСКІ Сава Іванавіч (1713, с. Вешкі Цвярской вобл., Расія — паміж 1774 і 1780), рускі архітэктар; прадстаўнік барока. Вучыўся ў І.*Корабава* (1732—38). У 1741—67 гал. архітэктар Адміралцействаў-калегіі ў Пецярбургу. У творчасці спалучаў традыцыі рус. з прыёмамі і формамі ордэрнай архітэктуры. Удзельнічаў у буд-ве палацава-парк. комплексу ў Царскім Сяле (цяпер г. Пушкін Ленінградскай вобл.; 1745—60). Пабудаваў у Пецярбургу палацы П.Б.Шарамецева на Фантанцы (1750—55) і І.І.Шувалава (1753—55), Нікольскі марскі сабор (1753—62), склады «Новая Галандыя» (1765—80), перабудаваў Кунсткамеру (1754—58). Сярод вучняў В.*Бажэнаў* і І.*Старoў*.

Літ.: Петров А.Н. С.Чевакинский. Л., 1983.

ЧА́ВЕС, Падуа Чавес-і-Рамірэс дэ (Padua Chávez y Ramirez de) Карлас (13.6.1899, Кальсада-дэ-Такула, каля Мехіка — 2.8.1978), мексіканскі кампазітар, дырыжор, педагог; адзін з заснавальнікаў (з С.*Рэвуэльтасам*) сучаснай мекс. кампазітарскай школы. У 1928—49 кіраўнік заснаванага ім сімф. аркестра Мехіка (пазней Нац. сімф. аркестр). Адначасова ў 1928—34 дырэктар Нац. кансерваторыі, у 1947—52 Нац. ін-та прыгожых мастацтваў і л-ры. Для творчасці 1920—30-х г. уласцівы элементы нар. (у прыватнасці, індзейскай) музыкі, муз. канструктывізму, з 1940-х г. — ускладненне муз. мовы з рысамі акадэмізму. Сярод твораў: опера «Панфіла і Лаўрэта» (паст. 1957); балеты «Новы агонь» (паст. 1928), «Чатыры сонцы» (паст. 1930); 7 сімфоній (1933—61); творы для арк. нар. мекс. інструментаў, камерна-інстр. ансамблі, п'есы для фп., хоры з арк. а cappella, рамансы.

Літ.: Доценко В.Р. К.Чавес // Музыка стран Латинской Америки. М., 1983.

ЧА́ВУС Пётр Рыгоравіч (н. 7.1.1939, в. Старына Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл.), бел. ваен. дзеяч. Ген.-палк. (1992). Скончыў Ташкенцкае ваен. агульнавайск. камандное вучылішча (1960), Ваен.-паліт. акадэмію (1973), Акадэмію Генштаба (1980), вышэйшыя акад. курсы пры той жа акадэміі (1989). З 1960 на камандных і штабных пасадах у шэрагу ваен. акруг СССР, у тл. ў БВА, а таксама ў Цэнтр. групе войск у Чэхаславакіі, у складзе сав. войск у Афганістане. У 1991 нач. Ін-та ваен. гісторыі Мін-ва абароны СССР, нач. штаба — 1-ы нам. нач. Грамадзянскай абароны СССР. Са снеж. 1991 міністр па справах абароны, у 1992—94 в.а. міністра, нам. міністра абароны Рэспублікі Беларусь. Да сак. 1995 ваен. саветнік пры СМ Рэспублікі Беларусь.

ЧА́ВУСКІ Міхась (Майсей Моталевіч; 25.12.1904, в. Майскае Жлобінскага р-на Гомельскай вобл. — 1.7.1984), бел. пісьменнік. Вучыўся ў Камуніст. ін-це журналістыкі ў Ленінградзе (1934—37). У 1917—30 працаваў наборшчыкам, з 1935 на парт. і журналісцкай рабоце ў Мінску. У 1941—43 рэдагаваў сатыр. газету-плакат «Раздавім фашысцкую гадзіну», з 1947 у час. «Вожык» (у 1947—55 гал. рэдактар), у 1961—70 дырэктар Бюро прапаганды маст. л-ры Саюза пісьменнікаў Беларусі. Друкаваўся з 1937. Выступаў у жанры сатыры. Аўтар зборнікаў сатыр. апавяданняў, камедый, гумарэсак, фельетонаў «Крытычны момант» (1954), «Індык на курорце» (1960), «Рука руку мые» (1964), «Чаму ж не смяяцца?» (1969), дакумент. аповесці «Фарбамі гневу» (2-е выд., 1978).

Тв.: Стрэляны Вераб'ёў. Мн., 1976.

ЧА́ВУСКІ МАСЛАСЫРЗАВО́Д. Пабудаваны ў 1968—73 у г. *Чавусы* Магілёўскай вобл. Мае цэхі: сыраробны, маслацэх, сырны падвал і дапаможныя. З 1996 — адкрытае акц. т-ва. У 1999—2000 сыраробны і маслацэх пераабсталяваны. Асн. прадукцыя (2003): сыры цвёрдыя («Пашахонскі», «Кастрамскі»), плаўленыя («Каўбасны», сыркі «Дружба», «Шакаладны»), сыркі глазураваныя, тварожныя, ёгурты, цэльнамалочная прадукцыя, казеін, малочны цукар.

ЧА́ВУСКІ ПАВЕ́Т, адм.-тэр. адзінка на Беларусі ў 18—20 ст. Утвораны 2.4.1777 у складзе Магілёўскай губ. Цэнтр — г. *Чавусы*. З 23.12.1796 у Беларускай губ., да яго далучаны прылеглыя часткі скасаваных Копыскага і Старабыхаўскага пав. З 27.2.1802 зноў у Магілёўскай губ. з аднаўленнем межаў 1777; мелася 5 мястэчак: Горы, Дрыбіна, Расна, Сухары, Чэрнеўка. З 1861 падзяляўся на 9 валасцей: Галянёўскую, Гарадзецкую, Гладкаўскую, Горскую, Дрыбінскую, Радамскую, Расненскую, Чавускую, Чэрнеўскую. У 1897 пл. 2168 кв. вёрст, каля 88,7 тыс. чал., у т.л. 78 тыс. праваслаўных, 2,5 тыс. католікаў, 7,5 тыс. іудзеяў. З іх у г. Чавусы пражывала каля 5 тыс. чал., у мястэчках — каля 6,9 тыс. чал. 8.4.1918 Горская вол. перададзена Горацкаму пав. З 26.4.1919 павет у складзе Гомельскай губ. 4.5.1922 скасаваны, яго тэр. падзелена паміж Магілёўскім і Горацкім пав. *В.Л.Насевіч.*

Аўтар В.Л.Насевіч

ЧА́ВУСКІ РАЁН. Размешчаны ў цэнтр. частцы Магілёўскай вобл. Утвораны 17.7.1924 (у сучасных межах з 16.9.1959). Пл. 1,5 тыс. км^2. Нас. 24,1 тыс. чал. (2003), гарадскога 46,1%. Сярэдняя шчыльн. 16 чал. на 1 км^2. Цэнтр — г. *Чавусы*. Раён уключае 168 сельскіх нас. пунктаў, 10 сельсаветаў: Антонаўскі, Благавіцкі, Вайнілаўскі, Ваўкавіцкі, Гарбавіцкі, Дужаўскі, Жаліўскі, Прудкоўскі, Пуцькаўскі, Цемравіцкі. Большая ч. тэр. раёна забруджана радыенуклідамі (1—5 Ku/км^2, месцамі да 15 Ku/км^2).

Тэр. раёна ў межах *Аршанска-Магілёўскай раўніны*. Паверхня раўнінна-ўзгорыстая з комплексам западзінных мікраформ. Пераважаюць вышэ. 150—190 м (87%). Найвыш. пункт 203 м (на ПдУ ад в. Новааляксандраўка). Карысныя выкапні: торф, цагельныя гліі-

ны, буд. пяскі, пясчана-жвіровы матэрыял. Сярэдняя т-ра студз. -7,7 °С, ліп. 18,2 °С. Ападкаў 642 мм за год. Вегетац. перыяд 186 сут. Найб. р. Проня з прытокамі Бася і Раста (з Рудзеяй, Беліцай і Плясной). Вадасховішча на р. Рудзея. Глебы с.-г. угоддзяў: дзярнова-падзолістыя (63,1%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (19,4%), тарфяна-балотныя (11,7%) і інш. Пад лесам 31,5% тэр. Найб. лясныя масівы на Пн (у міжрэччы Басі і Проні) і У (левабярэжжа Проні). У складзе лясоў хваёвыя, яловыя, бярозавыя, асінавыя, дубовыя, чорна- і шэраальхавыя. Штучныя лесанасаджэнні каля 4%, пераважна хвойныя. Пад балотамі 2,2% тэр. У межах раёна біял. заказнік мясц. значэння (бабры) каля в. Брады; ахоўныя тарфянікі Азярышча, Барадзілаўскае-Крамянец, Бярозавае, Каралеўшчына, Рабяткі. Помнікі прыроды мясц. значэння: парк у г. Чавусы, валуны каля в. Брады і Новааляксандраўка, участак лесу «Ялова» ў Мокрадскім лясніцтве.

Агульная пл. с.-г. угоддзяў 88,2 тыс. га, з іх асушаных 11,8 тыс. га. На 1.1.2003 у раёне 22 калгасы, 1 саўгас, 5 фермерскіх гаспадарак. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, вырошчванні збожжавых, зернебабовых, рапсу, лёну, бульбы, агародніны. Прадпрыемствы прам-сці: буд. матэрыялаў (жалезабетонныя вырабы, цэгла), харч. (масла, сыры, цэльнамалочныя прадукты, сушаная агародніна), першаснай апрацоўкі лёну (ільнавалакно, траста), кааператыўнай. Па тэр. раёна праходзяць чыгунка Магілёў—Чавусы—Крычаў, аўтадарогі: Магілёў—Слаўгарад, Магілёў—Чавусы—Мсціслаў, Магілёў—Чавусы—Чэрыкаў. У раёне 16 сярэдніх, 2 базавыя, 3 пачатковыя школы, школа-інтэрнат, школа мастацтваў, дзіцячая спарт. школа, раённы Дом культуры, 25 клубаў, 26 б-к, 2 бальніцы, паліклініка, 2 амбулаторыі, 26 фельч.-ак. пунктаў. Санаторыі «Зара», «Раста». Раённы гісторыка-краязнаўчы музей. Помнікі архітэктуры: царква (2-я пал. 19 ст.) у в. Благавічы. Выдаецца газ. «Іскра».

Г.С.Смалякоў, П.М.Сырадоеў.

ЧА́ВУСЫ, горад, цэнтр Чавускага р-на Магілёўскай вобл., на р. Бася. За 41 км ад г. Магілёў, 5 км ад чыг. ст. Чавусы на лініі Магілёў—Крычаў. Вузел аўтадарог на Магілёў, Крычаў, Мсціслаў, Чэрыкаў. 10,9 тыс. ж. (2002). Прадпрыемствы харч. (*Чавускі масласырзавод*), пач. апрацоўкі лёну, буд. матэрыялаў прам-сці. Брацкія магілы: сав. воінаў, партызан і ахвяр фашызму. Помнікі археал.: стаянка (неаліт), 2 селішчы (2—10—16 ст.), курганныя могільнікі (9—12 ст.).

У пісьмовых крыніцах згадваецца з сярэдзіны 16 ст. як в. Чавусавічы. З 1589 у складзе Магілёўскай эканоміі. З 1604 горад Ч., у 1634 атрымаў магдэбургскае права і герб — выява св. Марціна, узброенага мячом, на кані. У 1648 у Ч. 176 дамоў. У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 Ч. заняты рус. войскамі і падараваны царом Аляксеем Міхайлавічам палкоўніку Бел. палка К.*Паклонскаму*. З вясны 1656 рэзідэнцыя казацкага палкоўніка І.*Нячая*. Увосень 1660 вызвалены войскамі Рэчы Паспалітай. У час Паўночнай вайны 1700—21 горад разрабаваны ў 1708 шведскімі войскамі; паступова адбудаваны. У пач. 1770-х г. у Ч. каля 2530 ж., больш за 420 дамоў, штогод праводзіўся кірмаш. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі, цэнтр павета Магілёўскай (у 1796—1802 Беларускай) губ. У 1778 зацверджаны план забудовы горада. У 1781 Ч. нададзены новы герб — на чырв. полі перакрыжаваныя шабля і меч, аб'яднаныя лаўровым вянком. З 1789 у Ч. працавала 2-класнае нар. вучылішча. У 1825 каля 4 тыс. ж., 569 дамоў, 5 цэркваў, 30 крам, праводзіліся 2 кірмашы на год. У 1897 у Ч. 4690 ж., з іх 41,1% пісьменных; з 1901 працавалі 3-класнае гар. вучылішча, царкоўнапрыходская школа; у 1904 — 6,1 тыс. ж., праводзіліся 4 кірмашы на год, дзейнічала 41 прамысловае (97 рабочых) і 41 рамеснае (239 рамеснікаў) прадпрыемствы, працавалі бальніца на 24 ложкі, друкарня, бібліятэка-чытальня. З 25.5.1919 Ч. ў складзе Гомельскай губ. РСФСР, з 1922 — цэнтр воласці Магілёўскага пав. З 1924 у складзе БССР, цэнтр раёна. У 1939 — 7,2 тыс. ж. У Вял. Айч. вайну з 15.7.1941 акупіраваны ням. фашыстамі, якія загубілі ў горадзе і раёне 1786 чал. Вызвалены 25.6.1944 часцямі 50-й арміі 2-га Бел. фронту ў ходзе *Магілёўскай аперацыі 1944* ва ўзаемадзеянні з партыз. палком «Грынацыць» (камандзір С.У.Грышын). У 1959 у Ч. 7,8 тыс. ж.

В.В.Грынявецкі.

ЧА́ГА, бярозавы чорны грыб, бясплодная форма губавага базідыяльнага грыба інанотуса скошанага (Inonotus obliquus) сям. гіменахетавых. Пашырана пераважна ва ўмераных шыротах Паўн. паўшар'я. На Беларусі трапляецца паўсюдна; паразітуе на ствалах дрэў, пераважна бяроз. Выклікае ствалавую гніль драўніны.

Споры грыба, што трапілі ў рану жывога дрэва, прарастаюць у бясплодны *міцэлій* і ўтвараюць Ч. — шчыльны, шурпаты нарост або наплыў з чорнай, патрэсканай паверхняй, дыям. да 50 см. Унутр. тканка цвёрдая, амаль дравяністая, карычневая. Пладовае цела грыба развіваецца пад карою пасля гібелі дрэва; мае выгляд плоскай распасцёртай масы даўж. да 3 м, шыр. 20—30 см., з размешчаным на паверхні аднаслойным трубчастым *гіменафорам*. Споры яйцападобныя, гладкія, бясколерныя. Экстракт Ч. (бефунгін) мае біягенныя стымулятары, выкарыстоўваецца ў медыцыне.

Чага на ствале бярозы.

ЧАГАРЫ́, Годвін-Остэн, Дапсанг, найвышэйшая вяршыня *Каракарума* (8611 м, 2-я ў свеце пасля *Джамалунгмы*). Складзена з гранітаў і гнейсаў. Буйныя ледавікі (Балтара і інш.).

ЧА́ГАС (Chagos), 1) архіпелаг у Індыйскім ак.; уладанне Вялікабрытаніі. Пл. каля 200 км^2. Складаецца з 5 груп атолаў, якія ўяўляюць сабой вяршыні падводнага Мальдыўскага хрыбта, акаймаваныя каралавымі рыфамі. Вырошчваюць какосавыя пальмы; вываз копры. Рыбалоўства. На самым буйным (25 км^2) атоле Дыега-Гарсія ваен. база ЗША. 2) Глыбакаводны жолаб каля ўсх. падножжа гэтага архіпелага або паўд.-ўсх. падножжа Мальдыўскага хр. ў выглядзе вузкай упадзіны тыпу грабена. Даўж. 510 км, шыр. 25 км, макс. глыб. 5431 м.

ЧА́ГІН Мікалай Міхайлавіч (20.11.1823, г. Арол, Расія — 6.6.1909), рускі архітэктар. Скончыў АМ у Пецярбургу (1848, акад. архітэктуры з 1853). З 1852 працаваў на Беларусі і ў Літве. Паводле яго праектаў пабудавана і рэканструявана шмат цэркваў у бел. гарадах і вёсках (у Гродне, Шчучыне, Ашмянах, Рэчыцы, Слоніме, Дзярэчыне і інш.). Перабудаваў Мінскую Петрапаўлаўскую царкву. У 1885 збудаваў капліцу Аляксандра Неўскага ў Вільні.

ЧАГО́ЛІН Пётр Міхайлавіч (н. 31.12.1923, с. Дзям'янаўка Кустанайскай вобл., Казахстан), бел. вучоны ў галіне тэхн. кібернетыкі. Д-р тэхн. н. (1969), праф. (1972). Засл. дз. нав. і тэхн. Беларусі (1985). Скончыў Стаўрапольскі пед. ін-т (1949). З 1965 у Ін-це тэхн. кібернетыкі АН Беларусі (заг. лабараторыі). З 1992 працуе ў Расіі. Навук. працы па стат. праблемах тэхн. кібернетыкі, ідэнтыфікацыі працэсаў і дынамічных аб'ектаў, сістэмах кіравання і аўтаматызацыі навук. даследаванняў. Распрацаваў асновы тэорыі імітацыйнага мадэліравання дынамічных сістэм і распазнавання вобразаў. Дзярж. прэмія Беларусі 1986.

Тв.: Автоматизация преобразования сложных форм графической информации. Мн., 1973 (разам з Э.М.Леановічам, У.П.Савенкавым); Методы и средства обработки сигналов в дискретных базисах. Мн., 1987 (разам з Р.Х.Садыхавым, У.П.Шмярко).

М.П.Савік.

ЧАГРА́ВА, птушка сям. крачак; гл. ў арт. *Крачкі*.

ЧАД (Tchad, Chad), бяссцёкавае возера ў Цэнтр. Афрыцы (у сумежных раёнах Нігерыі, Нігера, Чада і Камеруна), на выш. 240 м. Даўж. 270 км, шыр. да 150 км. Пл. ад 10 да 26 тыс. км^2 (у залежнасці ад шматгадовых ваганняў сцёку ў Ч.), глыб. адпаведна 4—11 м. У эпохі павышэння вільготнасці клімату (апошняе 5—6 тыс. г. назад) пл. возера дасягала да 400 тыс. км^2. Зах. і паўд. берагі нізкія, б.ч. забалочаныя; паўн.-ўсх. і

ўсх. моцна парэзаныя, каля іх шматлікія астравы. У Ч. упадаюць рэкі Шары і Камадугу-Іобе. У месцах упадзення рэк вада ў возеры прэсная, на астатняй ч. — слаба саланаватая. У Ч. значны падземны адток, які дае жыўленне грунтавым водам прылеглых раёнаў. Водзяцца ламанціны, бегемоты, кракадзілы; шмат водных і балотных птушак. Рыбалоўства. Суднаходства.

ЧАД (Tchad), Рэспубліка Чад (République du Tchad), дзяржава ў Цэнтр. Афрыцы. Мяжуе на Пн з Лівіяй, на Пд з Цэнтральнаафрыканскай Рэспублікай, на У з Суданам, на З з Камерунам, Нігерыяй, Нігерам. Пл. 1284 тыс. км^2. Нас. 8997 тыс. чал. (2002). Сталіца — г. *Нджамена*. Афіц. мовы — французская і арабская. Падзяляецца на 14 прэфектур. Нац. свята — Дзень незалежнасці (11 жніўня).

Герб і сцяг Рэспублікі Чад.

Дзяржаўны лад. Ч. — рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1996, ухваленая на рэферэндуме. Кіраўнік дзяржавы — прэзідэнт, які выбіраецца ўсеагульным галасаваннем на 5 гадоў, ён жа з'яўляецца кіраўніком урада і галоўнакамандуючым узбр. сіламі. Заканад. орган — Нац. сход (125 дэпутатаў, іх тэрмін паўнамоцтваў 4 гады).

Прырода. Паверхня — плоская раўніна выш. 250—400 м. На Пн нагор'е Тыбесты (выш. да 3415 м, г. Эмі-Кусі), на ПнУ плато Эрды і Энеды (выш. да 1450 м), на ПдУ масіў Вадаі (выш. да 1666 м), на З раўніна Канем. Карысныя выкапні: баксіты (запасы — 14 млн. т), сода, соль, дыятаміты, вапнякі, каалін, нафта, уран, берыл, волава, медзь, золата. Клімат трапічны пустынны на Пн, экватарыяльна-мусонны на Пд. Сярэдняя т-ра студз. ад 15 °С на Пн да 21 °С на Пд, ліп. адпаведна 30 °С і 33 °С. Ападкаў ад 100—250 мм на Пн да 1000 мм на Пд. Бываюць пясчаныя буры. Асн. водныя рэсурсы на Пд краіны. Гал. рэкі Шары з прытокам Лагоне (бас. воз. Чад) і Батха (бас. воз. Фітры). Расліннасць на Пн прадстаўлена пустыннымі відамі (тамарыск, нізкарослая акацыя, вярблюджая калючка), у зоне Сахель — апустыненыя саванны з зараснікамі хмызнякоў на чырвона-бурых глебах, на Пд — тыповыя саванны з баабабамі і пальмамі на чырвоных глебах. З жывёл ва ўнутр. раёнах пераважаюць траваедныя млекакормячыя (слон, жырафа, буйвал, насарогі, антылопы) і драпежнікі (леў, леапард, шакал, гіена). У рэках і азёрах — кракадзілы і бегемоты. Шмат птушак, змей, насякомых. Нац. паркі Закума і Манда, запаведнікі Абу-Тэльфан і Сініянка-Мінія.

Насельніцтва. Этнічны склад Ч. прадстаўлены народамі, якія размаўляюць на шары-нільскіх (сара — 28%, багірмі, тама, даго, тубу, кануры, мілі), чадскіх (мубі, хаўса, маса) і нігера-кангалезскіх (мбум) мовах. Каля 30% насельніцтва — арабы, у т.л. суданскія (12%). Сярод вернікаў пераважаюць мусульмане-суніты (50%), ёсць хрысціяне (католікі і пратэстанты 25%), прыхільнікі традыц. рэліг. культаў (25%). Сярэднегадавы прырост 3,3% (2000). Сярэдняя шчыльн. 7 чал. на 1 км^2. Каля 20% насельніцтва — качэўнікі. У гарадах жыве 23% насельніцтва. Найб. горад — Нджамена (735 тыс. ж., 2002). Каля 100 тыс. ж. у гарадах Мунду і Сарх. 85% эканамічна актыўнага насельніцтва занята ў сельскай гаспадарцы.

Гаспадарка. Ч. — эканамічна слаборазвітая краіна, адна з найбяднейшых у Афрыцы. Валавы ўнутр. прадукт (ВУП) у 2000 склаў 8,1 млрд. дол. (каля 1 тыс. дол. на 1 чал.). Аснова эканомікі — сельская гаспадарка (64% ВУП). Апрацоўваецца каля 3% тэр. Захавалася абшчыннае землекарыстанне. Гал. галіны — баваўнаводства і жывёлагадоўля. Асн. экспартная культура бавоўнік (збор — 161 тыс. т бавоўны-сыраду, 1999); пашырана на Пд краіны. Сорга (514 тыс. т) і проса (367 тыс. т) вырошчваюць паўсюдна, рыс (100 тыс. т) — каля гарадоў, арахіс (511 тыс. т) — у цэнтр. і ўсх. раёнах, фінікавую пальму — у аазісах на Пн краіны. На ўласныя патрэбы вырошчваюць фасолю (72 тыс. т), гарох (55 тыс. т), кунжут (29 тыс. т), фаніо, пшаніцу. Жывёлагадоўля (16% ВУП) — традыц. занятак 40% насельніцтва. Краіна займае адно з першых месцаў у Афрыцы па колькасці пагалоўя жывёл. Гадуюць (млн. галоў, 2001) буйн. раг. жывёлу (5,9), коз (5,3), авечак (2,4), вярблюдаў (1,1), птушак (5), аслоў (0,35), коней (0,2), свіней (0,02). Рыбалоўства. Улоў рыбы ў 1999 склаў 85 тыс. т, частка ўлову экспартуецца ў суседнія краіны. Прам-сць развіта слаба (12% ВУП). Асн. галіна — тэкст., уключае каля 20 дробных прадпрыемстваў кампаніі «КАТОНЧАД» у г. Сарх. Бавоўнаачышчальныя прадпрыемствы ў гарадах на Пд краіны. Вытв-сць бавоўны 87,7 тыс. т (1997). Прадпрыемствы па перапрацоўцы прадукцыі жывёлагадоўлі (найб. бойні-халадзільнікі ў г. Нджамена), вытв-сці цукру-рафінаду (26,7 тыс. т, 1997), піва (123,2 тыс. Дл), цыгарэт (39,3 млн. шт.), мукі. Вытв-сць электраэнергіі (100 млн. кВт·гадз, 1998) на электрастанцыях у Нджамене. Здабыча соды і солі (на паўн. узбярэжжы воз. Чад і саланчаках Энеды), вапняку і гліны для цагельнага з-да ў Нджамене.

Транспарт аўтамаб., водны, паветраны. Чыгунак няма. Даўж. аўтадарог 32 тыс. км, у т.л. з цвёрдым пакрыццём 7 тыс. км. Водныя шляхі для грузаперавозак

Да арт. **Чад**. Саванна ў сухі сезон.

па рэках Шары і Лагоне выкарыстоўваюцца 3 мес за год. Міжнар. аэрапорт у Нджамене. Экспарт (172 млн.дол., 2000) бавоўны, жывой жывёлы (20% кошту экспарту), прадукцыі жывёлагадоўлі. Імпарт (223 млн. дол., 2000) машын і абсталявання, спажывецкіх тавараў, харч. прадукцыі, нафтапрадуктаў. Асн. гандл. партнёры: Францыя, Партугалія, Германія, Камерун. Грашовая адзінка — франк КФА.

Гісторыя. Чалавек насяляе тэр. Ч. з найстараж. часоў. Да 9 ст. ў бас. воз. Чад склалася дзяржава *Канем-Борну*, якая ў 12—13 ст. уключала значную ч. тэр. сучаснага Ч. З 11 ст. тут пашырыўся *ісламізм*, які стаў рэлігіяй пануючых вярхоў. У 16 ст. на У Ч. склалася дзяржава Вадаі, на ПдЗ — Багірмі; у канцы 19 ст. значная ч. іх уладанняў увайшла ў склад *Рабаха дзяржавы*. У 1890-я г. на тэр. Ч. з'явіліся франц. войскі, якія ў 1900 знішчылі дзяржаву Рабаха, да 1914 падпарадкавалі ўсю тэр. Ч., і як асобную калонію ўключылі яе ў склад Франц. Экватарыяльнай Афрыкі; з 1946 — «заморская тэрыторыя» Францыі. У 1947 створана Прагрэс. партыя Ч. (ППЧ), прадстаўнікі якой у 1957 узначалілі першы афр. ўрад Ч. З 1958 Ч. — аўт. дзяржава ў складзе Франц. *Супольніцтва*, з 11.8.1960 — незалежная дзяржава. У 1962 уведзены аднапарт. рэжым ППЧ на чале з прэзідэнтам Ф.Тамбалбаем. Супраць яго вялі ўзбр. барацьбу мусульм. народы Паўн. Ч. У крас. 1975 Тамбалбай забіты, уладу захапіў Вышэйшы ваен. савет на чале з ген. Ф.Малумам. Пад націскам паўн. паўстанцаў Малум у жн. 1978 стварыў кааліцыйны ўрад на чале з лідэрам Узбр. сіл Поўначы (УСП) Х.Хабрэ. У выніку ўзбр. барацьбы паміж рознымі паўн. групоўкамі ў ліст. 1979 створаны Пераходны ўрад нац. адзінства (ПУНА) на чале з лідэрам Фронту нац. вызвалення Ч. (ФНВЧ) Г.Уэдэем; Хабрэ стаў міністрам абароны. З сак. 1980 разгарнулася грамадз. вайна паміж ФНВЧ, якому дапамагалі Лівія, і УСП, што апіраліся на Францыю. У чэрв. 1982 УСП захапілі сталіцу. Хабрэ ў вер. 1982 абвешчаны прэзідэнтам Ч. У 1983—87 яго войскі разгромілі ўзбр. сілы ФНВЧ і ўсталявалі кантроль над б.ч. тэр. краіны. У вер. 1989 падпісана мірнае пагадненне паміж Ч. і Лівіяй. 1.12.1990 рэжым Хабрэ скінуты сіламі апазіцыі, якія ўварваліся з тэр. Судана; іх лідэр ген. І.Дэбі абвешчаны прэзідэнтам Ч. У кастр. 1991 дазволена шматпартыйнасць.

У сак. 1996 прынята новая канстытуцыя Ч. На альтэрнатыўных выбарах 1996 і 2001 прэзідэнтам краіны зноў выбраны Дэбі.

З паліт. партый і рухаў Ч. рэальным уплывам карыстаецца толькі Патрыят. фронт выратавання. Ч. — чл. ААН (з 1960) і Афр. Саюза (з 2002).

Літ.: Губер А.А., Ким Г.Ф., Хейфец А.Н. Новая история стран Азии и Африки. 3 изд. М., 1982.

К.А.Анціпава (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *В.У.Адзярыха* (гісторыя).

ЧА́ДНЫ ГАЗ, тое, што *вуглякіслы газ*.

ЧАДРА́ (цюрк.), лёгкае пакрывала (белага, сіняга, радзей чорнага колеру) у жанчын-мусульманак, у якое яны пры выхадзе з дому захутваюцца з галавы да ног, пакідаючы адкрытымі толькі вочы. Бытуе ў шэрагу народаў Ірана, Афганістана, у араб. краінах (Емен, Саудаўская Аравія) і інш. Гл. таксама *Парандж*.

ЧАЕЗБО́РАЧНАЯ МАШЫ́НА, навясная або самаходная машына для збору спелых маладых парасткаў чаю (*чайнага куста*) з 2—3 лісцікамі (флешаў). Бываюць грабеньчата-пнеўматычныя і касілкавыя.

У СССР з 1963 выкарыстоўвалася навясная Ч.м. «Сакартвела» (на раўнінных участках плантацый і схілах стромкасцю да 8°). Самаходная Ч.м. ЧА-650/900 прызначана для збору чайнага лісця на раўнінах і схілах да 20°. Мае хадавую ч. з рухавіком і 3 вядучымі коламі, чаезборачны апарат, матавіла, асн. і выносны транспарцёры, бункер. Гумавымі лопасцямі матавіла высокія флешы падгінаюцца да рэжучай дугі, прыціскаюцца да адборачных валікаў, зразаюцца нажамі і транспарцёрам падаюцца ў бункер; недаспелыя парасткі спец. пальцамі з капронавымі ніткамі адхіляюцца і не зразаюцца. Прадукцыйнасць да 0,2 га/гадз.

В.М.Кандрацьеў.

ЧАЁТ, мексіканскі агурок (Sechium), род кветкавых раслін сям. гарбузовых. 1 від — Ч. ядомы (S.edule). Культывуецца ў трапічных і субтрапічных краінах.

Чаёт.

Шматгадовая трава з лазячым пры дапамозе вусікаў сцяблом даўж. некалькі метраў. Лісце 5-лопасцевае. Кветкі аднаполыя, аднадомныя, жаўтавата-белыя, тычынкавыя — у гронках, песцікавыя — адзіночныя. Плады грушападобныя, буйныя (часам да 1 кг). Спажываюцца ў ежу няспелыя плады і крухмаланосныя клубні. Сцёблы — матэрыял для плеценых вырабаў.

ЧАЙ, харчовы прадукт, які вырабляецца са спецыяльна апрацаваных верхавінкавых парасткаў (флешаў) *чайнага куста* і выкарыстоўваецца для прыгатавання напітку. Чайны экстракт мае дубільных рэчываў 15,6 — 16%, кафеіну 2—3%, эфірных алеяў 0,006—0,021%, вітаміны С, Р і інш. Выпускаюць Ч. байхавы (рассыпісты) і прасаваны.

Паводле спосабаў апрацоўкі лісця адрозніваюць Ч. чорны, зялёны (кок-Ч.), жоўты і чырв. (аалонг). Пры вырабе чорнага Ч. сабраныя парасткі сартуюць, завяльваюць, скручваюць, ферментуюць і сушаць. У выніку ферментацыі ў сыравіне раскладаюцца бялкі, акісляюцца дубільныя рэчывы і Ч. набывае прыемны смак, духмянасць і колер. Чырв. і жоўты Ч. атрымліваюць заўчасным спыненнем ферментацыі на розных стадыях. Вытв-сць зялёнага Ч. адрозніваецца тым, што ў лістах прапаркай разбураюцца ферменты, замацоўваецца зялёны колер, яны завяльваюцца і не ферментуюцца. Напітак з Ч. ўзбуджае нерв. сістэму, танізуе, павышае працаздольнасць.

В.Л.Мароз.

ЧАЙБАЛСА́Н Харлагійн [8.2.1895, Цэцэнханскі (Усходні) аймак, Манголія — 26.1.1952], мангольскі дзярж. дзеяч. Маршал МНР (1936). Двойчы Герой МНР (1941, 1945). Вучыўся ў вучылішчы пры Іркуцкім настаўніцкім ін-це (1914—17), у ваен. акадэміі ў Маскве (1923—24). Адзін з арганізатараў Манг. нар.-рэв. партыі (МНРП, 1921), неаднаразова выбіраўся чл. ЦК МНРП, яго Прэзідыума і Палітбюро. З 1924 галоўнакамандуючы Манг. нар.-рэв. арміяй (МНРА). З 1928 на кіруючых дзярж. пасадах. З 1939 прэм'ер-міністр МНР. Быў галоўнакамандуючым МНРА пры сумесных аперацыях сав. і манг. войск у час *Халхінгольскага канфлікту 1939* і *Маньчжурскай аперацыі 1945*. У Вял. Айч. вайну адзін з арганізатараў кампаніі па аказанні матэрыяльнай дапамогі Чырв. Арміі, у т.л. танк. калоны «Рэвалюцыйная Манголія» і авіяэскадрыллі «Мангольскі арат». Імем Ч. наз. горад у Манголіі. На Пленуме ЦК МНРП (1988) асуджана яго дзейнасць, якая прывяла да масавых рэпрэсій і беззаконнасці ў краіне.

Схема работы **чаезборачнай машыны**: 1 — парасткі, што падлягаюць зразанню; 2 — рэжучая дуга; 3 — капронавыя ніткі; 4 — пальцы; 5 — лопасці матавіла; 6 — недаспелыя парасткі; 7 — адборачныя валікі.

ЧА́ЙКА, у беларусаў дашчаная плаская донная лодка. Пашырана ў басейне р. Нёман. Вядомы канструкцыі 2 тыпаў: з завостранымі кармой і носам; з адвеснай кармой і завостраным носам.

Чайка. Вёска Беражна Карэліцкага раёна Гродзенскай вобл. 1979.

ЧА́ЙКА Валерый Паўлавіч (н. 2.12.1950, г. Таганрог Растоўскай вобл., Расія), бел. мастак. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1976). Працуе ў манум.-дэкар. і афармленчым мастацтве, у маст. праектаванні. Сярод твораў: маст. афармленне інтэр'ераў і экстэр'ераў БДУ, экстэр'ера абл. радзільнага дома (абодва 1978), праект інтэр'ера і вітражы станцыі метро «Інстытут культуры» (1984), праект інтэр'ера і люстры ў аэрапорце «Мінск-2» (1988—89), размалёўка ў рэстаране «Беларусь» (1995), размалёўка і вітражы ў рэстаране «Гасціны двор» (1996), аб'ёмна-прасторавыя кампазіцыі для Палаца Рэспублікі (2000) — усе ў Мінску. Адзін з аўтараў вітражоў з размалёўкай і аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі для храма Св. Духа ў г. Беласток (Польшча, 2001, з С.Рабашчуком і Б.Скрамблевічам). Творы вылучаюцца высокай маст. культурай, шматпланавасцю зместу, гарманічным уключэннем у арх. асяроддзе.

Л.Ф.Салавей.

ЧА́ЙКА Марыя Ціханаўна (31.12.1929, г. Горкі Магілёўскай вобл. — 30.9.1997), бел. вучоны ў галіне фізіялогіі раслін. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1991). Д-р біял. н. (1978), праф. (1992). Скончыла БДУ (1951). З 1956 у Ін-це эксперым. батанікі, з 1967 у Ін-це фотабіялогіі Нац. АН Беларусі (у 1981—97 заг. лабараторыі). Навук. працы па праблемах біясінтэзу хларафілу і біягенезе пігмент-бялковых комплексаў пластыдных мембран у раслін, ролі адаптацыйнага патэнцыялу фотасінтэтычнага апарату ў экстэнсіўных і інтэнсіўных сартоў злакавых культур.

Тв.: Биосинтез хлорофилла в процессе развития пластид. Мн., 1981 (разам з Г.Я.Саўчанка); Фотосинтетический аппарат и селекция тритикале. Мн., 1991 (у сааўт.).

С.С.Мельнікаў.

ЧА́ЙКА Павел Пятровіч (21.6.1889, в. Лютовічы Капыльскага р-на Мінскай вобл. — 9.1.1921), бел. ваен. дзеяч. Скончыў Іркуцкае вайск. вучылішча (1912). Удзельнік 1-й сусв. вайны, штабс-капітан. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 чл. партыі эсэраў. У пач. 1919 мабілізаваны ў Чырв. Армію, служыў у ваен. камісарыяце Слуцкага пав. З прыходам польскіх войск вярнуўся ў родную вёску, падтрымліваў сувязі з антыпольскім падполлем. Летам 1920 зноў мабілізаваны ў Чырв. Армію, хутка дэзерціраваў. У ліст. 1920 далучыўся да *Слуцкага паўстання 1920*, па прапанове Бел. рады Случчыны ўзначаліў 1-ы Слуцкі полк і адначасова ўсю Слуцкую брыгаду паўстанцаў. Быў стаўленікам бел. эсэраў, лічыў, што ў змаганні супраць сав. улады паўстанцы асуджаны на паражэнне. За вызваленне з палону камісара Слуцкага пав. Лебедзя па загадзе Бел. рады Случчыны арыштаваны, уцёк з-пад варты. 3.12.1920 здаўся сав. войскам. 7.1.1921 пастановай «тройкі» Асобага аддзела 16-й арміі «за антысавецкую дзейнасць» прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны ў 1992.

У.В.Ляхоўскі.

ЧА́ЙКІ (Lari), падатрад птушак атр. сеўцападобных. 4 сям.: *вадарэзы, крачкі, паморнікі*, чайкавыя (Laridae). Каля 100 відаў. Пашыраны ўсюды. Жывуць на ўзбярэжжах мораў, азёр, рэк, на балотах і інш. На Беларусі 20 відаў. Найб. пашыраны Ч. азёрная (Larus ridibundus), Ч. шызая (L. canus), крачка белакрылая (Chlidonias leucopterus), крачка чорная (Ch. niger). 3 віды: Ч. малая (L. minutus), Ч. серабрыстая (L. argentatus), крачка малая (Sterna albifrons) занесены ў Чырв. кнігу. 6 відаў і 2 падвіды ў Чырв. кнізе МСАП.

Даўж. да 80 см, маса да 2,5 кг. Апярэнне густое і шчыльнае, афарбоўка мяняецца ў залежнасці ад узросту і сезону, пераважае белы, буры, чорны і шэры колеры. Крылы доўгія, дзюба прамая, вострая ці загнутая на канцы, з выступам на ніжняй сківіцы. Ёсць перапонкі на лапах. Манагамы. Нясуць 1—5 яец. Кормяцца рыбай, грызунамі, насякомымі, мярцвячынай, часта адкідамі. Некат. — прамежкавыя гаспадары паразітаў рыб.

Э.Р.Самусенка.

ЧАЙКО́Ў Андрэй Андрэевіч (11.8.1945, Мінск — 8.12.1992), бел. скрыпач, скрыпічны майстар. Скончыў Маладзечанскае муз. вучылішча (1969). З 1962 артыст аркестра Дзярж. ансамбля танца Беларусі, з 1963 — Дзярж. акад. сімф. аркестра Беларусі, з 1967 — Сімф. аркестра бел. тэлебачання і радыё, у 1978—82 майстар-рэстаўратар смычковых муз. інструментаў Бел. кансерваторыі. Адзін з ініцыятараў стварэння калекцыі рэдкіх муз. інструментаў Нац. музея гісторыі і культуры Беларусі.

М.Д. Браценнікаў.

ЧАЙКО́ЎСКІ Барыс Аляксандравіч (10.9.1925, Масква — 7.2.1996), расійскі кампазітар. Засл. дз. маст. Расіі (1969). Нар. арт. СССР (1985). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1949). Вучань В.*Шабаліна*, М.*Мяскоўскага*, Дз.*Шастаковіча*. Яго творы вылучаюцца глыбока рус. нац. складам. Значнае месца ў творчасці займаюць сімф. і камерна-інстр. музыка: 4 сімфоніі (1947, 1962, 1967, 1980), «Тэма і 8 варыяцый» для арк. (1974), 4 прэлюдыі (1984), музыка для арк. (1987), канцэрты для фп. (1971), скрыпкі (1969), віяланчэлі (1964) з арк.; камерна-інстр. ансамблі, у т.л. 6 стр. квартэтаў; санаты для фп., для 2 фп., для скрыпкі і фп., віяланчэлі і фп., вак. цыклы, музыка да кіно і радыёпастановак. Дзярж. прэмія СССР 1969.

ЧАЙКО́ЎСКІ Пётр Ільіч (7.5.1840, г. Воткінск, Удмурція — 6.11.1893), рускі кампазітар; дырыжор. Чл.-кар. Акадэміі прыгожых мастацтваў у Францыі (1892). Ганаровы д-р музыкі Кембрыджскага

Чайкі: 1 — азёрная; 2 — малая; 3 — серабрыстая; 4 — трохпальцая; 5 — шызая; 6 — крачка рачная.

ун-та (1893). Скончыў Пецярбургскую кансерваторыю (1865, вучань А.*Рубінштэйна*, М.*Зарэмбы*). У 1866—77 праф. Маскоўскай кансерваторыі. З 1878 займаўся пераважна кампазітарскай дзейнасцю, з 1887 сумяшчаў яе з дырыжорскай. Майстар-сімфаніст, муз. драматург, тонкі псіхолаг, раскрыў у музыцы ўнутр. свет чалавека: ад лірычнай задумы

М.Ц.**Чайка**.

П.І.**Чайкоўскі**.

шэўнасці да глыбокай трагедыі; стварыў вышэйшыя ўзоры опер, балетаў, сімфоній, камерных твораў. Як оперны драматург і сімфаніст паўплываў на кампазітараў розных школ і кірункаў (А.Глазуноў, Г.Малер, М.Мяскоўскі, С.Рахманінаў, А.Скрабін, С.Танееў, Дз.Шастаковіч і інш.). Сярод твораў: оперы, у іх ліку на сюжэты рас. жыцця «Яўген Анегін» («лірычныя сцэны», паст. 1879; у Дзярж. т-ры оперы і балета Беларусі 1933, 1936, 1940, 1948, 1954, 1986), «Чарадзейка» (паст. 1887; у т-ры оперы і балета Беларусі 1958), «Пікавая дама» (паст. 1890; у т-ры оперы і балета Беларусі 1934, 1941, 1948, 1960, 1972, 1983); з рас. і зах.-еўрап. гісторыі «Апрычнік» (паст. 1874), «Арлеанская дзева» (паст. 1881), «Мазепа» (паст. 1884; у т-ры оперы і балета Беларусі 1952); жыццесцвярджальная фантазійная «Іаланта» (паст. 1892; у т-ры оперы і балета Беларусі 1952, 1975, 1993); лірыка-камед. «Каваль Вакула» (паст. 1876; 2-я рэд. «Чаравічкі», паст. 1887; у т-ры оперы і балета Беларусі 1949) і інш. Наватар у галіне балета, у якім музыка — вядучы кампанент балетнай драматургіі: «Лебядзінае возера» (паст. 1877; у т-ры оперы і балета Беларусі 1938, 1948, 1967, 1978, 1986), «Спячая прыгажуня» (паст. 1890; у Нац. т-ры балета Беларусі 1954, 1970, 1990, 2000), «Шчаўкунок» (паст. 1892; у т-ры оперы і балета Беларусі 1956, 1982). Да сусв. шэдэўраў належаць 4—6-я сімфоніі (1877—93), праграмная сімфонія «Манфрэд» (1885), уверцюра-фантазія «Рамэо і Джульета» (1869), фантазія «Франчэска да Рыміні» (1876), «Італьянскае капрычыо» (1880), 3 канцэрты для фп. з арк. (1875—93), канцэрт для скрыпкі з арк. (1878), «Варыяцыі на тэму ракако» для віяланчэлі з арк. (1876), фп. трыо «Памяці вялікага мастака» (1882), рамансы. Аўтар перакладаў для фп. ў 4 рукі 50 рус. нар. песень са зборнікаў К.Вільбаа і М.Балакірава (1868—72), рэдактар зборніка рус. песень, сабраных В.Пракуніным. Выступаў як крытык. У т-ры оперы і балета Беларусі на музыку Ч. паст. балет «Серэнада» (1993). З 1958 у Маскве раз у 4 гады праводзіцца Міжнар. конкурс яго імя.

Тв.: Полн. собр. соч. Т. 1—63. М., 1940—90; Полн. собр. соч. Т. 2—17. Лит. произв. и переписка. М., 1953—81.

Літ.: Чайковский М. Жизнь П.И.Чайковского. Т. 1—3. М.; Лейпциг, 1900—02; Асафьев Б.В. Избр. труды. Т. 2. М., 1954; Орлова Е.М. П.И.Чайковский. М., 1980; Вайдман П.Е. Творческий архив П.И.Чайковского. М., 1988.

Н.М.Юдзеніч.

ЧАЙКО́ЎСКІ Яўген Уладзіміравіч (н. 27.3.1933, Мінск), бел. вучоны ў галіне аўтам. кіравання, вынаходнік і педагог. Канд. тэхн. н. (1971). Скончыў БПІ (1961). З 1958 у галіновых НДІ і АН Беларусі. З 1984 у Рэсп. цэнтры тэхн. творчасці вучняў, з 1996 на выкладчыцкай рабоце. Навук. працы па праектаванні сістэм аўтам. кіравання і аўтаматызацыі навук. даследаванняў, праблемах арганізацыі дзіцячай навукова-тэхн. творчасці. Аўтар вынаходстваў у галіне каротказамкнутавай радыёсувязі, аўтам. рэгулявання і аматарскага прылада- і тэлескопабудавання (гл. *Тэлескоп-цэласкат*, «*Уранія*»).

Тв.: Счетно-решающее устройство для вычисления к.п.д. брутто котлоагрегата // Теплоэнергетика. 1972. Вып. 2; Наносекундный лазерный спектрофлуориметр с автоматизированной обработкой данных (у сааўт.) // Квантовая электроника. 1986. Т. 13, № 11.

А.І.Болсун.

ЧАЙКО́ЎЦЫ, Вялікае таварыства прапаганды, адна з буйных арг-цый рэв. *народніцтва* ў Расіі ў канцы 1860 — пач. 70-х г. Узнікла ў 1869 у Пецярбургу як гурток М.А.Натансона — М.В.Чайкоўскага (назва ад яго прозвішча), які ў 1871 аб'яднаўся з гуртком С.Л.*Пяроўскай*. Т-ва мела аддзяленні ў Маскве, Кіеве, Адэсе (агульная колькасць каля 100 чал.). Ч. рыхтавалі прапагандыстаў для работы ў «народзе», выдавалі і распаўсюджвалі рэв. л-ру, былі ініцыятарамі «*хаджэння ў народ*». Летам-восенню 1874 амаль усе арыштаваны, многія асуджаны на «*працэсе 193-х*». Пазней многія Ч. ўдзельнічалі ў стварэнні «*Зямлі і волі*», «*Народнай волі*», у пач. 20 ст. — партыі *сацыялістаў-рэвалюцыянераў*.

ЧАЙЛАХЯ́Н Міхаіл Хрыстафаравіч (21.3.1902, г. Растоў-на-Доне, Расія — 30.11.1991), армянскі і рас. вучоны ў галіне фізіялогіі раслін. Акад. АН СССР (1968), Арм. АН (1971). Засл. дз. нав. Арменіі (1967). Скончыў Ерэванскі ун-т (1926). З 1935 у Ін-це фізіялогіі раслін Рас. АН (заг. лабараторыі). У 1941—48 у Ерэванскім ун-це (заг. кафедры, праф. з 1943), адначасова (1941—46) у Армянскім с.-г. ін-це. Навук. працы па фундаментальных праблемах фітабіялогіі. Аўтар гарманальнай тэорыі развіцця раслін (1937). Распрацаваў метады выкарыстання фітагармонаў для рэгуляцыі росту і цвіцення раслін.

Тв.: Гормональная теория развития растений. М.; Л., 1937; Основные закономерности онтогенеза высших растений. М., 1958; Факторы генеративного развития растений. М., 1964.

С.С.Мельнікаў.

ЧАЙЛД (Childe) Гордан Вір (14.4.1892, г. Сідней, Аўстралія — 19.10.1957), англійскі археолаг. Скончыў Сіднейскі і Оксфардскі ун-ты. З 1927 праф. Эдынбургскага ун-та, з 1946 праф. і дырэктар Ін-та археалогіі Лонданскага ун-та. Удзельнік і кіраўнік археал. раскопак на Аркнейскіх а-вах (каля Шатландыі). Аўтар прац пра неаліт і бронзавы век у Зах. Еўропе і на Б. Усходзе, папулярных кніг па археалогіі.

ЧА́ЙНІКАЎ Кузьма Паўлавіч (2.1.1898, в. Вял. Дак'я Вавожскага р-на, Удмурція — 1.11.1937), удмурцкі пісьменнік, этнограф. Вучыўся ў Вышэйшым літ.-маст. ін-це (1922—25). Друкаваўся з 1914. Пісаў на удм. і рус. мовах пад псеўд. Кузебай Герд. Рэпрэсіраваны, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1958. У зб-ках вершаў «Гусляр» (1922), «Квітнеючая зямля» (1927), «Ступені» (1931) тэмы жыцця і працы удмуртаў, рэвалюцыі і грамадз. вайны, калектывізацыі. Аўтар паэм «Вайна» (1916), «Завод» (1921), «Дзесяць гадоў» (1931), п'ес, вершаў і апавяданняў для дзяцей, падручнікаў і кніг для пач. школы, артыкулаў і навук. прац па пытаннях фальклору, літ.-знаўства, лінгвістыкі, этнаграфіі, педагогікі. На удм. мову пераклаў верш Я.Купалы «А хто там ідзе?» (1915, апубл. 1922 пад наз. «Хто гэта?»).

Тв.: Рус. пер. — В полете к солнцу: Стихи. Ижевск, 1989; О ней я песнь пою: Стихи, статьи, письма. Ижевск, 1997.

Літ.: Ермаков Ф.К. Кузебай Герд: Жизнь и творчество. Ижевск, 1996.

«ЧА́ЙНЫ ГРЫБ», японскі грыб, сімбіёз дражджавога грыба (Schizosaccharomycodes ludwigii) з воцатнакіслай бактэрыяй (часцей Acetobacter xylinum). Мае выгляд тоўстай, слізістай, слаістай плеўкі на паверхні падсалоджанага (звычайна да 10% цукру) чайнага настою (адсюль назва). Дрожджы збраджваюць цукар з утварэннем невял. колькасці этылавага спірту і вуглякіслага газу, а воцатнакіслая бактэрыя збраджвае цукар з выдзяленнем воцатнай к-ты. У выніку вадкасць (чайны квас) набывае кісла-салодкі смак і злёгку газіруецца. Асвяжальны напітак.

С.І.Бельская.

ЧА́ЙНЫ КУСТ, чай (Thea), род кветкавых раслін сям. чайных; часам уключаюць у род *камелія*. 2 віды: Ч.к. кітайскі (T. sinensis) і асамскі (T. assamica), які часта лічаць разнавіднасцю кітайскага. Радзіма — горныя раёны Паўд.-Усх. Азіі. Уведзены ў культуру з 4 ст. н.э. ў Кітаі, з 9 ст. — у Японіі і Карэі, з пач. 19 ст. — у Інданезіі, Індыі, Шры-Ланцы; вырошчваюць у Афрыцы, Паўд. Амерыцы, В'етнаме, Іране, Турцыі і

краінах Б. Усходу. Чайны напой у Еўропе спажываюць з 16 ст.

Невял. вечназялёныя дрэвы (у культуры — кусты). Жывуць 100 і больш гадоў. Лісце кароткачаранковае, эліптычнае, даўж. 7—10 см. Кветкі адзіночныя або па 2—4 у пазухах ліста, белыя ці ружовыя, духмяныя. Плод — каробачка. Лісце Ч.к. мае 1,5—3,5% кафеіну, 20—24% дубільных рэчываў, флаваноіды, вітаміны групы В, С, нікацінавую і пантатэнавую к-ты. З ліста і маладых парасткаў (флешаў) выпрацоўваюць прадукт (байхавы, плітачны і інш. *чай*), з якога гатуюць напітак; з адходаў атрымліваюць кафеін, вітамінныя прэпараты, вяжучыя сродкі; з насення — алей. Лек., харч., тэхн. расліны.

ЧА́ЙЧЫЦ Мікалай Васілевіч (н. 3.6.1940, в. Здзітава Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне с.-г. машынабудавання. Канд. тэхн. н. (1971), праф. (1998). Скончыў БСГА (1964), дзе і працуе (у 1982—85 заг. кафедры, у 1985—98 дэкан ф-та). Навук. працы па распрацоўцы тэхналогій, машын і рабочых органаў для апрацоўкі глебы, сяўбы, догляду за пасевамі збожжавых і прапашных культур, уборкі лёну.

Тв.: Эффективная сельскохозяйственная техника. Мн., 1993 (разам з А.В.Клачковым); Сельскохозяйственные машины. Мн., 1997 (разам з А.В.Клачковым, В.П.Буяшовым).

ЧА́КА, другая назва прыроднай вобласці *Гран-Чака* ў цэнтры Паўд. Амерыкі.

ЧА́КА, Шака (каля 1787—28.9.1828), зулускі інкасі (правіцель), які ўзначаліў аб'яднанне роднасных плямён на тэр. сучаснага Наталя (Паўд.-Афр. Рэспубліка). У 1816 стаў правадыром клана зулу і пашырыў сваю ўладу на тэр. Наталя, частку сучасных правінцый: Трансваль, Капская і Аранжавая. Стварыў дысцыплінаванае войска (лічылася ў Паўд. Афрыцы непераможным), залажыў асновы дзяржаўнасці зулусаў. У апошнія гады жыцця меў неабмежаваную ўладу, правіў дэспатычна. Забіты змоўшчыкамі.

Літ.: Риттер Э.А. Чака Зулу: Пер. с англ. М., 1968.

ЧАКА́Н, 1) інструмент для *чаканкі*, які мае форму зубіла з затупленым і закругленым рабочым кантам. 2) Ударная *халодная зброя*, формай падобная на малаток для чаканкі з дзюбападобным лязом (разнавіднасць *кляўца*).

Чакан. Маскоўскае царства. 16 ст.

ЧАКА́НАЧНЫ ПРЭС, вертыкальны крывашыпны *прэс* для *чаканкі* і інш. аперацый аб'ёмнай *штампоўкі* з малым



Кінематычная схема **чаканачнага прэса**: 1 — станіна; 2, 5 — верхняе і ніжняе звёны калена; 3 — шатун; 4 — крывашып; 6 — паўзун; 7 — штамп.

рабочым ходам. Адметная асаблівасць Ч.п. — шасцізвённы крывашыпнакаленны механізм прывода паўзуна, верхняе звяно калена якога злучана са станінай, а ніжняе — з паўзуном. Такі механізм пры малым моманце сілы на прывадным вале развівае вял. намаганне ў канцы рабочага ходу паўзуна.

ЧАКА́НКА, 1) адзін з працэсаў аб'ёмнай *штампоўкі*, што заключаецца ў абцісканні штампаванай дэталі ў чыставым штампе для павышэння дакладнасці памераў і якасці паверхні (напр., пры вырабе манет, медалёў). 2) Атрыманне рэльефных відарысаў на тонкаліставых загатоўках (гал. чынам медных) шляхам ручнога выбівання з дапамогай *чакана*. 3) Апрацоўка паверхні вырабаў, атрыманых ліццём (гал. чынам вырабаў прыкладнога мастацтва), з мэтай ліквідавання дробных дэфектаў. 4) Ч. шво ў — ушчыльненне заклёпачнага шва шляхам асаджвання ч. металу ўздоўж канта шва і па перыметры заклёпачных галовак.

ЧАКА́НКА мастацкая, тэхніка мастацкай апрацоўкі металу (звычайна ліставога) чаканамі рознага профілю; від манум.-дэкар. і *дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*. Ударамі чаканаў па вонкавым ці адваротным боку метал. ліста, пакладзенага на смалістую масу, гуму, падушачку з пяском, ствараюць пукатую ці ўвагнутую выяву. Мех. спосабам або хім. рэчывамі паверхні чаканеных вырабаў надаюць розныя адценні, часта ўпрыгожваюць *эмалямі*. Вядома са старажытнасці, асабліва была пашырана ў краінах Усходу, у Расіі, на Каўказе (шырока вядома ў стараж. і сучаснай Грузіі). На Беларусі вядома з 9—11 ст. у аздабленні ювелірных вырабаў, з 12 ст. ў аздабленні абкладаў кніг. Высокага ўзроўню дасягнула ў 16—17 ст. У многіх гарадах існавалі цэхі майстроў залатых і сярэбраных спраў, дзе працавала шмат чаканшчыкаў. З латуні, серабра, радзей золата выраблялі літургічнае начынне, абклады кніг і абразоў. У дэкоры пераважалі расл. матывы. Ч. нярэдка дапаўнялася гравіраваннем, чарненнем, залачэннем, эмалямі, устаўкамі з каштоўных камянёў. У 2-й пал. 17 ст. бел. майстры-чаканшчыкі С.Якаўлеў, Х.Абрасімаў, С.Захар'еў, Ф.Мікулаеў і інш. працавалі ў Сярэбранай палаце Маскоўскага Крамля, дзе выраблялі сярэбраны, медны, латунны гасп. і літургічны посуд. З 18 ст. чаканены дэкор набыў нар. трактоўку, пазней — рысы ракако і класіцызму. У 19 ст. Ч. нярэдка замянялася штампоўкай. З 1960-х г. пачалося адраджэнне маст. Ч. Дэкар. пано, рэчы сувенірнага і маст. прызначэння, манум.-дэкар. характару ў гэтай тэхніцы выконваюць прафес. і самадз. бел. мастакі (Ю.Адамовіч, М.Бруй, Ю.Гаўрын, Б.Дрозд, Ю.Любімаў, В.Міхайлюк, А.Паўлаў, А.Сурскі, Я.Шыбнёў), майстры ф-к маст. вырабаў.

Літ.: Высоцкая Н.Ф. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII—XVIII стст: [Альбом]. Мн., 1984; Сахута Е.М., Говор В.А. Художественные ремесла и промыслы Белоруссии. Мн., 1988. *Я.М.Сахута.*

Парасткі, лісце і кветка **чайнага куста** кітайскага.

ЧАКАНО́ЎСКІ Аляксандр Лаўрэнцьевіч (21.2.1833, г. Крэменец Цярнопальскай вобл., Украіна — 30.10.1876), расійскі даследчык Сібіры. Вучыўся на мед. ф-це Кіеўскага ун-тау. За ўдзел у паўстанні 1863—64 сасланы ў Сібір. Па даручэнні Сіб. аддз. Рус. геагр. т-ва ў 1869—71 правёў геал. даследаванні на Пд Іркуцкай губ. Сабраў першыя дакладныя звесткі па геалогіі рэгіёна р. Ніжняя Тунгуска (1873), ніжняга цячэння р. Лена і р. Алянёк. На Ніжняй Тунгусцы адкрыў радовішча кам. вугалю і графіту. У 1876 яму дазволена пераехаць у Пецярбург, дзе ён пачаў апрацоўку сабраных матэрыялаў. Імем Ч. наз. адкрыты ім краж паміж рэкамі Лена і Алянёк, горад у Іркуцкай вобл. і шэраг выкапнёвых раслін.

Літ.: Клеопов И.Л. А.Л.Чекановский, 1833—1876. Л., 1972.

Да арт. **Чаканка** мастацкая. Абклад абраза. Веткаўская школа. 18—19 ст.

ЧАКАНО́ЎСКІ (Czekanowski) Ян (6.10.1882, в. Глухаў каля г. Груец, Польшча — 20.7.1965), польскі антраполаг, этнограф, статыстык, дэмограф; заснавальнік т.зв. Львоўскай антрапалагічнай школы. Чл. Польск. АН (1957), д-р навук (1906). Скончыў Цюрыхскі ун-т (Швейцарыя). З 1906 працаваў у Музеі этнаграфіі ў Берліне, у 1907—09 удзельнічаў у ням. цэнтральнаафр. экспедыцыі. З 1911 хавальнік Музея антрапалогіі і этнаграфіі пры Пецярбургскай АН. У 1913—41 праф., рэктар Львоўскага ун-та, у 1945 праф. Каталіцкага ун-та ў Любліне, у 1946—60 Пазнанскага ун-та. Асн. працы па антрапалагічным складзе Еўропы і Цэнтр. Афрыкі, антрапалогіі Польшчы і Усх. Прыбалтыкі, расавым аналізе, праблеме паходжання славян (лакалізаваў месца іх першапач. рассялення на тэр. сучаснай Польшчы).

ЧАКА́НЫ (Saxicola), род птушак сям. раздовых атр. вераб'інападобных. 10 відаў. Пашыраны ў Еўразіі і Афрыцы. Жывуць на лугах, лясных балотах, высечках, узлесках і інш. На Беларусі 2 віды: звычайны Ч. лугавы (S. rubetra) і рэдкі залётны Ч. чорнагаловы (S. torquata).

Даўж. да 20 см, маса да 19 г. Апярэнне Ч. лугавога зверху чорна-бурае, знізу рыжаватае, на крылах, над вачамі белая палоска. У Ч. чорнагаловага апярэнне галавы чорнае (адсюль назва). Нясуць да 7 яец. Кормяцца насякомымі.

ЧА́КВІН Ігар Усеваладавіч (н. 20.8.1954, Мінск), бел. гісторык, этнолог і антраполаг. Д-р гіст. н. (1995). Скончыў БДУ (1977). З 1981 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нац. АН Беларусі. Даследуе праблемы этнагенезу і этнічнай гісторыі беларусаў эпохі феадалізму, фарміравання і развіцця іх этнічнай самасвядомасці, сучасныя міжэтнічныя і канфесіянальныя адносіны на Беларусі, пытанні палеаантрапалогіі і палеадэмаграфіі Беларусі 10—16 ст.

Чаканы: 1 — лугавы; 2 — чорнагаловы (самцы).

Зрабіў больш за 20 антрапал. рэканструкцый твару і фіз. тыпу жыхароў бел. зямель 10—18 ст. паводле краніяметрычных матэрыялаў са стараж. курганоў і могільнікаў крывічоў, радзімічаў, дрыгавічоў і балтаў. Адзін з аўтараў кніг «Праблемы сучаснай антрапалогіі» (1983), «Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя» (1985), «Палессе: Матэрыяльная культура» (1988), «Спадчына Скарыны» (1989), «Сям'я і сямейны быт беларусаў», «Скарына і яго эпоха», «Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі» (усе ў 1990), «Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі» (1993), «Гісторыя сялянства Беларусі» (т.1, 1997), «Беларусы» (1998).

Тв.: Праблемы этнагенезу беларусаў у працах славянскіх вучоных. Мн., 1982 (разам з В.К.Бандарчыкам). *Т.А.Навагродскі.*

ЧАКЛІ́НСКАЯ Марыяна (каля 1766, г. Паставы Віцебскай вобл. — ?), бел. і польская артыстка балета. Прыгонная падскарбія надворнага літ. А.Тызенгаўза. Вучылася ў яго балетных школах у Гродне і Паставах. У 1778 дэбютавала на сцэне *Гродзенскага тэатра Тызенгаўза* ў школьным спектаклі «Вясковы балет» Г.Петынеці. У 1785—97 салістка балетнай трупы «Таварыства танцоўшчыкаў яго каралеўскай вялікасці» ў Варшаве, выступала на каралеўскіх сцэнах, у «Тэатры народовым». Танцавала ў балеце «Лукас і Калінета» (1785) і інш. Верагодна, атрымала вольную.

ЧАКМАРО́Ў Аляксандр Пятровіч (12.9.1902, с. Вялікая Знаменка Каменска-Дняпроўскага р-на Запарожскай вобл., Украіна — 11.3.1975), украінскі вучоны ў галіне апрацоўкі металаў ціскам. Акад.

А.Л.**Чаканоўскі**.



А.П.**Чакмароў**.

АН Украіны (1948) і АН СССР (1968). Герой Сац. Працы (1972). Засл. дз. нав. і тэхн. Украіны (1962). Скончыў Днепрапятроўскі горны ін-т (1927). З 1930 у Днепрапятроўскім металург. ін-це, адначасова ў 1948—70 у Ін-це чорнай металургіі АН Украіны. Навук. працы па тэорыі пракаткі, удасканальванні пракатнага абсталявання, распрацоўцы новых тэхнал. працэсаў.

Тв.: Прокатка экономических профилей. Киев, 1963; Методы исследования процессов

прокатки. М., 1969 (разам з С.А.Альдзіеўскім).

ЧАКО́НА (ісп. chacona, італьян. ciaccona), 1) старажытны танец ісп. паходжання. Вядомы з канца 16 ст. Першапачаткова муз. памер 3/4 ці 3/2, тэмп жвавы. Ч. суправаджалася спевамі і ігрой на кастаньетах; у 17 ст. пашырылася ў Еўропе як павольны танец велічнага характару. 2) У Францыі балетны танец (Ж.Б.Люлі). Інстр. п'еса ўрачыстага характару на тэму, якая паўтараецца ў басе, блізкая да *пасакальі*. Тэмы Ч. невял. (4—8 тактаў), з яснай танц.-метрычнай асновай, звычайна гарманічна разамкнёныя. Склалася ў 17—18 ст. Да жанру Ч. звярталіся Дж.Фрэскабальдзі, І.Пахельбель, Дз.Букстэхудэ, І.С.Бах, у 19—20 ст. — М.Рэгер, Ф.Бузоні, Р.Шчадрын і інш. У 20 ст. Ч. амаль не адрозніваецца ад пасакальі.

ЧАКО́ЎСКІ Аляксандр Барысавіч (26.8.1913, С.-Пецярбург — 17.2.1994), рускі пісьменнік. Герой Сац. Працы (1973).

А.Б.**Чакоўскі**.

Скончыў Літ. ін-т імя М.Горкага ў Маскве (1939). З 1955 гал. рэдактар час. «Иностранная литература», у 1962—88 — «Литературной газеты». Друкаваўся з 1937. Апублікаваў літ. партрэты А.Барбюса (1937), Г.Гейнэ (1939), М.Андэрсена-Нексё (1940). Трылогія «Гэта было ў Ленінградзе» (кн. «Ваенны карэспандэнт», 1944; «Ліда», 1945; «Мірныя дні», 1947) пра подзвіг ленінградцаў у Вял. Айч. вайну. Раман «У нас ужо раніца» (1949, Дзярж. прэмія СССР 1950) пра першыя пасляваен. гады на Паўд. Сахаліне. Аповесці «Год жыцця» (1956, яе працяг раман «Дарогі, якія мы выбіраем», 1960), «Святло далёкай зоркі» (1962) на маральна-этычную праблематыку. Аўтар раманаў «Блакада» (кн. 1—4, 1968—73; Ленінская прэмія 1978), «Перамога» (кн. 1—3, 1978—81, Дзярж. прэмія СССР 1983), антыфаш. рамана «Нюрнбергскія прывіды» (кн. 1—2, 1987—89), аповесці «Нявеста» (1966), зб. «Літаратура, палітыка, жыццё» (1982) і інш. Многія яго творы экранізаваны, інсцэніраваны.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—6. М., 1974—77.

Літ.: Козлов И.Т. Александр Чаковский: Страницы жизни, страницы творчества. М., 1983; Синельников М. Диктует время: Очерк творчества А.Чаковского. М., 1983.

ЧАЛАВЕ́К, вышэйшая ступень эвалюцыі жывых арганізмаў на Зямлі, прадстаўнік біял. віду, сацыяльная істота і суб'ект гісторыі. Вывучэннем Ч. займаюцца біял. і грамадскія навукі: анатомія, фізіялогія, антрапалогія, псіхалогія, шэраг мед: навук, а таксама гісторыя, філасофія, сацыялогія, этнаграфія, педагогіка і інш. Усе выкапнёвыя формы Ч. (архантрапы, палеантрапы, неаантрапы) і Ч. сучаснага віду — Homo sapiens — адносяцца да атрада прыматаў і складаюць асобнае сям. *гамінідаў*. З жывёльнага свету Ч. вылучаюць свядомасць, здольнасць рабіць прылады працы і выкарыстоўваць іх для ўздзеяння на навакольнае асяроддзе. Ад антрапоідаў (якія бліжэй за ўсё стаяць да яго) Ч. адрозніваюць: прамахаджэнне, здольныя да маніпуляцыі рукі, высокаразвіты мозг, членараздзельная мова. Першыя прадстаўнікі сям. гамінідаў цалкам залежалі ад прыроды, біял. заканамернасці ў іх адаптацыі адыгрывалі асн. ролю, кліматычныя змены адбіваліся на структурных асаблівасцях, узмацнялі працэсы марфал. зменлівасці, садзейнічалі расаўтварэнню (гл. *Расы*). З завяршэннем антрапагенезу Ч., захоўваючы сваю біял. аснову, ператварыўся ў істоту сацыяльную. У яго існаванне і дзейнасць уключаюцца сац. фактары, якія паступова займаюць вядучую ролю ў развіцці грамадства. Біял. асаблівасці Ч. запісаны ў яго генетычнай праграме пры дапамозе малекулы ДНК, якая забяспечвае перадачу спадчынных адзнак. На тэр. Беларусі Ч. сучаснага віду з'явіўся прыкладна 26 тыс. гадоў назад (гл. *Каменны век*).

У ант. філасофіі Ч. разглядаўся як частка космасу, «малы сусвет», мікракосм (Дэмакрыт) — адлюстраванне і сімвал Сусвету, макракосму. Паводле Арыстоцеля, Ч. — істота, надзеленая духам, розумам («разумнай душой») і здольнасцю да грамадскага жыцця. У хрысціянстве Ч. — вобраз і падабенства Бога. Філасофія эпохі Адраджэння выходзіла з прынцыпу аўтаномнасці, дасканаласці і бязмежнасці творчых магчымасцей Ч., разуменя яго як цэнтра ўсяго Сусвету (макракосму). Р.Дэкарт сфармуляваў палажэнне аб мысленні як адзіным дакладным сведчанні чалавечага існавання. Г.Гегель лічыў Ч. суб'ектам духоўнай дзейнасці, які стварае свет культуры, з'яўляецца носьбітам агульназначнай свядомасці, усеагульнага ідэальнага пачатку — духу. Л.Феербах у межах антрапал. канцэпцыі ставіў у цэнтр філасофіі Ч., як пачуццёва-цялесную істоту. Марксісцкая канцэпцыя Ч. грунтавалася на яго трактоўцы як «сукупнасці ўсіх грамадскіх адносін». Прадстаўнікі розных філас. кірункаў 18—20 ст. рабілі акцэнт на такіх спецыфічных асаблівасцях Ч., як пачуццё (І.Гаман), воля (А.Шапенгаўэр), «гульня жыццёвых сіл» (Ф.Ніцшэ), інтуіцыя (А.Бергсон), перажыванне страху і канечнасці існавання (М.Хайдэгер) і інш. Ідэі *філасофіі жыцця* і *фенаменалогіі* паслужылі асновай для ўзнікнення *філасофскай антрапалогіі*. Натуралістычны падыход да Ч. характэрны для прадстаўнікоў *фрэйдызму*.

Сутнасць Ч., яго паходжанне і прызначэнне, яго месца ў свеце былі і застаюцца цэнтр. праблемамі філасофіі, рэлігіі, навукі і мастацтва. Генетычна звязаны з інш. жывымі арганізмамі, Ч. адрозніваецца ад іх наяўнасцю *свядомасці*, абстрактнага мыслення і мовы, здольнасцю пранікаць у сутнасць навакольных прадметаў і самога сябе. Ён з'яўляецца суб'ектам грамадска-гіст. працэсу, творцам каштоўнасцей матэрыяльнай і духоўнай культуры, носьбітам традыцый, якія змяшчаюць у сабе дасягненні *цывілізацыі*. Ч. ставіць перад сабой мэты і ўсведамляе матывы, якія заахвочваюць яго да дзейнасці. Неад'емнымі атрыбутамі Ч. з'яўляюцца перакананасць і вера — ад веры ў лагічныя ісціны да веры ў духоўны *Абсалют*. Як асоба Ч. — своеасаблівае адзінства агульначалавечых і індывід. якасцей. Ступень свабоды яго дзеянняў абмяжоўваецца прынятымі грамадствам маральнымі, прававымі нормамі і правіламі пэўнага віду дзейнасці. Аднак Ч. у пэўнай ступені свабодны ў выбары сац. роляў, вызначэнні ў іх межах варыянтаў сваіх дзеянняў, праяўленні творчага падыходу да выканання сваіх абавязкаў. У працэсе далучэння да культуры ў Ч. выпрацоўваюцца механізмы самакантролю, якія выяўляюцца ў здольнасці намаганнямі волі рэгуляваць спектр сваіх імкненняў, захапленняў, інстынктаў, каштоўнасных арыентацый і да т.п.

Літ.: Алексеев В.П. Человек: Эволюция и таксономия. М., 1985; Андреев И.Л. Происхождение человека и общества. 2 изд. М., 1988; Тегако Л.И., Саливон И.И. Основы современной антропологии. Мн., 1989; Фоули Р. Еще один неповторимый вид: Пер. с англ. М., 1990; Харитонов В.М. Введение в теорию антропогенеза и археологию палеолита. М., 1998; Парсонс Г. Человек в современном мире: Пер. с англ. М., 1985; Тараткевич М.В. Человек и его потребности. Мн., 1989; Трибулев Б.С. Природа и сущность человека. Мн., 1999; Человек: Филос.-энцикл. словарь. М., 2000; Ананьев Б.Г. Человек как предмет познания. 3 изд. СПб., 2001; Тейяр де Шарден П. Феномен человека: Пер. с фр. М., 2002; Хамитов Н.В. Философия человека: от метафизики к метаантропологии. Киев; М., 2002.

С.Ф.Дубянецкі, В.Дз.Марозаў, Л.І.Цягака.

«ЧАЛАВЕ́К І БІЯСФЕ́РА» (The Man and the Biosphere, MAB), міжнародная праграма па каардынацыі навук. даследаванняў узаемасувязей паміж чалавекам і навакольным прыродным асяроддзем. Прынята ў 1970 на 16-й сесіі Ген. канферэнцыі ЮНЕСКА як працяг *Міжнароднай біялагічнай праграмы*. Удзельнічае каля 90 краін, у т.л. Беларусь. Асн. мэта — распрацоўка навук. асновы для рацыянальнага выкарыстання і захавання рэсурсаў біясферы і глабальнага паляпшэння адносін паміж чалавекам і асяроддзем, для прагназіравання магчымых у будучым вынікаў сённяшняй дзейнасці чалавека і павелічэння яго магчымасцей эфектыўна кіраваць пры-

Эмблема міжнароднай праграмы **«Чалавек і біясфера»**.

роднымі рэсурсамі планеты, не змяншаючы іх патэнцыялу. Праграма ўключае асобныя праекты, прысвечаныя вывучэнню ўплыву дзейнасці чалавека (землекарыстанне, інж.-тэхн. работы, выкарыстанне энергіі) на асн. тыпы біёмаў Зямлі (тундры, лясы, саванны, стэпы, пустыні і інш.); прадугледжвае стварэнне сістэмы біясферных запаведнікаў, у якую з 1978 уваходзіць і *Бярэзінскі біясферны запаведнік*.

ЧАЛАВЕ́КА-ГАДЗІ́НА, адзінка вымярэння *рабочага часу*, якая адпавядае гадзіне фактычнай работы аднаго чалавека.

ЧАЛАВЕ́КА-ДЗЕНЬ, адзінка вымярэння *рабочага часу*, якая характарызуе работу аднаго чалавека на працягу аднаго рабочага дня (незалежна ад устаноўленай яго працягласці). У такіх адзінках часам вымяраюць агульны рабочы час работніка, брыгады за пэўны перыяд.

ЧАЛАВЕКАПАДО́БНЫЯ (Pongidae), сямейства вышэйшых *прыматаў*. Разам з сям. *гамінід* складаюць надсям. чалавекападобных прыматаў (Hominoidea). Выкапнёвыя Ч. былі пашыраны ў міяцэне і пліяцэне Еўразіі і Афрыкі. Ад міяцэнавых пліяпітэкаў (продкаў *гібонаў*) узялі пачатак дрыяпітэкі — зыходная форма ўсіх сучасных Ч. і чалавека (у адпаведнасці з тэорыяй Ч.*Дарвіна*). Сучасныя 4 віды Ч.: *арангутан*, *гарыла*, *шымпанзэ* (2 віды). Пашыраны ў Азіі і Афрыцы. Актыўныя ўдзень. Трымаюцца невял. групамі (2—15 асобін). Паводле анатама-фізіял. прыкмет найб. блізкія да чалавека гарыла і шымпанзэ (з апошнім — амаль 100-працэнтная ідэнтычнасць паводле складу поліпептыдаў). Усе віды Ч. занесены ў Чырв. кнігу МСАП.

Даўж. (выш.) да 180 см (зрэдку больш, гарыла), маса да 300 кг. Самкі драбнейшыя за самцоў. Хвост адсутнічае. Валасяное покрыва грубае, кароткае, часам касматае, чарнаватае (у арангутанаў чырванаватае). Тваравы аддзел слаба ўкрыты валасамі, далоні, падэшвы і вушы без валасоў. На чэрапе самцоў арангутанаў і гарыл развітыя грабяні. Зубоў 32. Мозг адносна вял., з развітымі барознамі і звілінамі, масай да 600 г, зрэдку да 750 г (у гарыл), што абумоўлівае ў Ч. высокаразвітую вышэйшую нерв. дзейнасць. Пярэднія канечнасці даўжэйшыя за заднія. Першы палец процістаўлены астатнім. У арангутанаў 12 пар рэбраў, у астатніх — 13 пар. 4 групы крыві (як у чалавека). Ёсць сляпая кішка, яе адростак (апендыкс) дасягае даўж. 25 см. Спажываюць пераважна расл. (гарыла), часам дробны жывёльны корм. Нараджаюць звычайна 1 дзіцяня.

А.М.Петрыкаў.

ЧАЛАВЕ́ЦТВА, 1) сукупнасць людзей, якія жывуць на Зямлі; тое, што *народанасельніцтва*. 2) Гіст. супольнасць людзей, якая склалася ў працэсе станаўлення і развіцця эканам., паліт., культ. і інш. сувязей паміж рознымі краінамі і народамі свету.

Паводле разлікаў дэмографаў, з часу з'яўлення краманьёнцаў (50—40 тыс. г. назад) на Зямлі змянілася каля 1600 пакаленняў «чалавека разумнага» (Homo sapiens) і пражывала прыкладна 60—70 млрд. людзей. Лічыцца, што папуляцыя людзей розных біял. *відаў* і іх падвідаў, якія адначасова пражывалі на Зямлі 1 млн. г. назад, налічвала каля 100 тыс. індывідаў, да моманту з'яўлення віду Homo sapiens больш за 50 тыс. г. назад — прыкладна 500 тыс., 40—30 тыс. г. назад — каля 5 млн. Да пач. 4-га тыс. да н.э. пасля пераходу людзей да земляробства і жывёлагадоўлі на Зямлі пражывала ўжо прыкладна 100 млн. чал. У наш час, паводле звестак ААН, на нашай планеце жыве каля 6 млрд. чалавек. Сучаснае Ч. разнастайнае ў расавых, этн. і культ. адносінах. У адрозненне ад рас шматлікія этнасы (*плямёны* і іх саюзы, *народнасці*, *нацыі*), з якіх складаецца Ч., уяўляюць сабой не біял., а сац.-гіст. супольнасці людзей, якія развіваюцца дзякуючы салідарнасці з сабе падобнымі паводле мовы, ладу жыцця, культ. і інш. прыкмет (гл. *Антрапагенез*, *Антрапасацыягенез*).

З моманту ўзнікнення розных лакальных і рэгіянальных *цывілізацый* эвалюцыя Ч. адбывалася на аснове ўласнага развіцця і запазычання народамі дасягненняў матэрыяльнай і духоўнай культуры інш. народаў. Гісторыя Ч. традыцыйна разглядаецца шляхам падзелу яе на Стараж. свет, сярэдневякоўе, новы час. У эвалюцыі Ч. вылучаюцца 4 тэхнал. эпохі: збіральніцтва і паляванне, аграрная, *індустрыяльнага грамадства*, *постіндустрыяльнага грамадства*, *інфармацыйнага грамадства*. З сярэдзіны 20 ст. ўзмацнілася тэндэнцыя да *інтэграцыі эканамічнай*, навук.-тэхн., паліт. і культ. супрацоўніцтва. Узніклі новыя жыццёва важныя для Ч. *глабальныя праблемы*. З'явілася новая навука — глабалістыка, прадмет якой — агульныя заканамернасці развіцця сучаснага Ч. ва ўмовах антрапагенна перагружанай Зямлі, стварэнне мадэлей навукова і духоўна арганізаванага свету. Аб'ектыўны працэс больш цеснага яднання Ч. (глабалізацыі) стварае перадумовы для ўключэння многіх краін у агульнасусв. эканам. і навук.-тэхн. *прагрэс*, выкарыстання перадавых тэхналогій для ўласнага развіцця, стварэння агульнапланетарнай (глабальнай) цывілізацыі пры захаванні разнастайнасці нац. культур, умоў іх узаемнага ўзбагачэння. У 2002 Ген. Асамблея ААН прыняла спец. рэзалюцыю аб рэагаванні на глабальныя пагрозы і выклікі Ч. (тэхнагенныя катастрофы, рост злачыннасці і наркаманіі, міжнар. тэрарызм і інш.), якая прадугледжвае фарміраванне глабальнай сістэмы процідзеяння гэтым пагрозам і ажыццяўленне практычных мер, накіраваных на дынамічнае паступальнае развіццё ўсіх састаўных ч. сучаснага Ч.

Літ.: Цивилизация: прошлое, настоящее и будущее человечества. М., 1988; Моисеев Н.Н. Быть или не быть... человечеству? М., 1999; Уткин А.И. Мировой порядок XXI в. М., 2001; Федотов А.П. Глобалистика: Начала науки о современном мире. 2 изд. М., 2002; Тойнби А.Д. Цивилизация перед судом истории: Пер. с англ. М., 2002.

В.Дз.Марозаў.

ЧАЛАВЕ́ЧНАСЦЬ, гуманнасць, маральна-псіхалагічная якасць, што характарызуе добразычлівыя і бескарыслівыя адносіны да людзей, адпаведнасць думак, пачуццяў і дзеянняў чалавека лепшым бакам яго сацыяпрыроднай сутнасці. Праяўляецца ў павазе да годнасці асобы, *справядлівасці* ў дзеяннях і ацэнках, самаахвярнасці ва ўчынках, *міласэрнасці*, спагадлівасці, праўдзівасці, шчырасці. Прадугледжвае таксама любоў да працы, прыроды, да ўсяго *прыгожага* ў дзеяннях чалавека, што надае яму высакароднасць, павагу інш. людзей. Адна з вышэйшых каштоўнасцей чалавека — любоў да Айчыны і да свайго народа. У паняцце «Ч.» уваходзіць таксама непрыманне любых праяў зла і насілля, жорсткасці, несправядлівасці і здрадніцтва.

Ч. грунтуецца на нормах *маралі*, сфармуляваных у розных этычных вучэннях і замацаваных шматгадовай жыццёвай практыкай. І.Кант вылучаў спец. этычныя катэгорыі, якія характарызуюць Ч. як высокую маральнасць, звязаную з практычным розумам (дапамога людзям, садзейнічанне іх шчасцю, адмаўленне ад хлусні, рабалепства, зайздрасці, пагарды і да т.п.). В.Р.Бялінскі лічыў Ч. вышэйшай дабрачыннасцю, бо «без яе чалавек ёсць толькі жывёліна». Праблему Ч. ў 20 ст. разглядалі А.Камю, Ж.П.Сартр, Э.Фром, З.Фрэйд і інш.

Прынцыпы Ч., агульнага дабра і гуманізму адстойвалі ў сваёй творчасці Ф.Скарына, С.Будны, А.Доўтірд, Я.Даманеўскі, Ф.Багушэвіч, Я.Лучына, Я.Колас, Я.Купала і інш. бел. мысліцелі і асветнікі. Гл. таксама *Гуманізм*, *Дабро* і *зло*.

Літ.: Фромм Э. Человек для себя: Иметь или быть?: Пер. с англ. Мн., 1997; Скарына Ф. Творы. Мн., 1990; О человеческом в человеке: [Сб.] М., 1991; Бердяев Н.А. О назначении человека. М., 1993; Кант И. Основы метафизики нравственности: Пер. с нем. М., 1999.

В.Дз.Марозаў.

«ЧАЛАВЕ́ЧЫХ АДНО́СІН» ТЭО́РЫЯ, канцэпцыя кіравання ў арганізацыях (найперш прамысловых), якая грунтуецца на маральна-псіхал. фактарах стымулявання работніка і павышэння прадукцыйнасці працы. Сфарміравалася як альтэрнатыва *тэйларызму* ў выніку сац. эксперыменту, праведзенага ў 1927—32 на з-дах кампаніі «Уэстэрн электрык» у г. Хоўтарн (каля г. Чыкага, ЗША). Група даследчыкаў пад кіраўніцтвам псіхолага Э.Мэё даказала, што маральна-псіхал. клімат у прац. калектыве, характар узаемаадносін работнікаў паміж сабой і з кіраўніцтвам у значнай ступені ўплываюць на прадукцыйнасць працы: пры дэспатычным рэжыме яна зніжаецца, а пры добразычлівых, гуманных узаемаадносінах павышаецца. Вучонымі распрацавана сістэма прынцыпаў і метадаў кіравання, арыентаваных на стварэнне т.зв. псіхал. дабрабыту ў прац. калектывах, здольных прадухіліць канфлікты. Паводле Мэё, стварэнне добразычлівага мікраклімату на рабочым месцы здольна кампенсаваць недахопы грамадскага ладу, а гуманныя адносіны ў сферы вытв-сці непазбежна вядуць да сац. гармоніі. У 1960-я г. «Ч.а.»т. дапоўнена тэорыяй «кіравання

праз саўдзельніцтва» (Д.Макгрэгар і інш.), паводле якой прадпрымальнік павінен бачыць у наёмным работніку не толькі работніка, але і сац. партнёра, а наёмны работнік у наймальніку — не толькі гаспадара, але і свайго кампаньёна. У 1970-я г. атрымалі пашырэнне «групавыя нормы і стылі кіравання» рабочымі. *Т.І.Адула.*

ЧАЛАЙДЗЮ́К Міхаіл Фаміч (н. 19.8.1929, с. Павурок Валынскай вобл., Украіна), бел. канструктар выліч. тэхнікі. Ганаровы радыст СССР (1989). Скончыў Львоўскі політэхн. ін-т (1960). У 1971—93 нач. аддзялення, гал. інжынер НДІ ЭВМ у Мінску. Распрацаваў прынцыпы канструявання шэрагу мабільных ЭВМ, нам. гал. канструктара ЭВМ ЕС 1035. Дзярж. прэмія СССР 1983. *М.П.Савік.*

ЧАЛАМЕ́Й Уладзімір Мікалаевіч (30.6.1914, г. Седльцы, Польшча — 8.12.1984), савецкі вучоны ў галіне механікі, ракетабудавання і касманаўтыкі. Акад. АН СССР (1962, чл.-кар. 1958). Двойчы Герой Сац. Працы (1959, 1963). Скончыў Кіеўскі авіяц. ін-т (1937), дзе і працаваў; адначасова ў Ін-це прыкладной матэматыкі і механікі АН УССР. З 1941 у Цэнтр. ін-це авіяц. маторабудавання (з 1944 дырэктар і гал. канструктар). З 1959 ген. канструктар ракетна-касм. тэхнікі. Навук. працы па канструкцыі і дынаміцы машын, тэорыі ваганняў, дынамічнай устойлівасці пругкіх сістэм, тэорыі сервамеханізмаў. Стварыў першы ў СССР пульсуючы паветрана-рэактыўны рухавік (1942). Пад яго кіраўніцтвам створаны важныя аб'екты авіяц., ракетнай і касм. тэхнікі, у т.л. ракетаносьбіт і ШСЗ «*Пратон*», ШСЗ «*Палёт*», арбітальныя станцыі «Алмаз». Ленінская прэмія 1959. Дзярж. прэміі СССР 1967, 1974, 1982. Залатыя медалі АН СССР імя Жукоўскага (1964) і імя Ляпунова (1977).

Тв.: О возможности повышения устойчивости упругих систем при помощи вибрации. М., 1956; Исследование пневматических и гидравлических сервомеханизмов. М., 1958.

Літ.: Боголюбов Н.Н., Седлов Л.И. В.Н.Челомей // Избранные проблемы прикладной механики. М., 1974.

У.С.Ларыёнаў.

ЧА́ЛІСАЎ Міхаіл Аляксандравіч (14.3.1898, г. Таганрог, Расія — 26.7.1973), бел. і рас. вучоны ў галіне псіхіятрыі. Д-р мед. н. (1941), праф. (1945). Скончыў Растоўскі ун-т (1923). З 1923 працаваў у розных гарадах Расіі. З 1951 у Мінскім мед. ін-це (заг. кафедры), адначасова (1952—68) гал. псіхіятр Мін-ва аховы здароўя Беларусі. Навук. працы па пытаннях клінічнай псіхіятрыі.

Тв.: Некоторые данные к патогенезу шизофрении // Шизофрения: (Вопр. нозологии, патогенеза, клиники и анатомии). М., 1962; Состояние печени у лиц, страдающих хроническим алкоголизмом // Актуальные вопросы психиатрии и невропатологии. М., 1963.

ЧАЛМА́ (цюрк.), мужчынскі галаўны ўбор у мусульман у выглядзе доўгага кавалка тканіны, абгорнутага некалькі разоў вакол галавы, звычайна паверх шапкі, фескі ці цюбецейкі. У розных народаў форма і колер Ч. вызначаюць этнічную, сац. і культавую прыналежнасць уладальніка (напр., зялёную Ч. насілі асобы, якія лічыліся нашчадкамі прарока, ці людзі, што наведалі Мекку; белую — астатнія мусульмане).

ЧАЛО́ЎСКІ Сымон Юльянавіч (1853?, Магілёўскай губ. — пасля 1915), бел. археолаг, краязнавец. Скончыў Маскоўскі ун-т (1888). Працаваў у г. Клімавічы (міравым суддзёй па сял. справах, чл. пав. з'езда дваранства, кіраваў сіроцкім прытулкам), быў чыноўнікам па асобых даручэннях Магілёўскага губернатара А.С.Дамбавецкага. У 1890-я г. вёў археал. даследаванні ў Падняпроўі. Абследаваў (з М.В.*Фурсавым*) археал. помнікі ў Быхаўскім, Клімавіцкім, Мсціслаўскім, Рагачоўскім, Чэрыкаўскім пав. і склаў карту археал. помнікаў Магілёўскай губ. Сярод адкрытых ім помнікаў гарадзішча і 20 курганоў у Хоцімску. У Мсціславе знайшоў стараж. гравюру абразоў Тупічэўскай Маці Божай (1711), гравіраваную дошку з выявай сям'і святых і інш. матэрыялы. Удзельнік 9-га археал. з'езда ў Вільні (1893).

Тв.: Дневник курганных раскопок, произведенных по поручению г. начальника Могилевской губернии А.С.Дембовецкого, в течение лета 1892 г. в уездах Рогачевском, Быховском, Климовичском, Чериковском и Мстиславском. [Могилев], 1892 (разам з М.В.Фурсавым); Дневник курганных раскопок, произведенных по поручению... А.С.Дембовецкого... в 3-х уездах Могилевской губернии. Могилев, 1893. *Г.А.Каханоўскі.*

ЧА́ЛЫ Багдан Іосіфавіч (н. 24.6.1924, Кіеў), украінскі пісьменнік. Скончыў Кіеўскі ун-т (1951). Працаваў у рэдакцыях газет, гал. рэдактарам час. «Барвінок». Аўтар паэт. і празаічных кніг для дзяцей «У ясную сонечную раніцу» (1947), «Як Барвінак і Рамонак у цёплыя краіны ляталі» (1968), «Сто прыгод Барвінка і Рамонка» (1973), «Барвінак у школе» (1977), «Мае дванаццаць месяцаў» (1985), «Маманты ў яблыневых джунглях» (1989), «Рудыкі» (1998), «Барвінак і далёкія сузор'і» (2002) і інш., дакумент. аповесці «Любі мяне пры ўсякай долі...» (1989: з У.Ліпскім) пра моладзь, вывезеную ў час Вял. Айч. вайны ў Германію; п'ес, публіцыстычных твораў, сцэнарыя кінафільма «Закон Антарктыды» (1963). На ўкр. мову пераклаў асобныя творы Я.Купалы, Э. Агняцвет, М.Аўрамчыка, В.Віткі, М.Калачынскага, А.Куляшова, М.Танка. Дзярж. прэмія Украіны імя М.Астроўскага 1972. На бел. мову яго творы пераклалі А.Вольскі, А.Вялюгін, Калачынскі, М.Маляўка.

Тв.: Бел. пер. — Прадаўцы заморскіх сувеніраў. Мн., 1961; Партрэт у вігваме. Мн., 1979.

У.М.**Чаламей.** М.П.**Чалы.** Я.Р.**Чамадураў.**

ЧА́ЛЫ Мікалай Палікарпавіч (7.7.1915, г. Купянск Харкаўскай вобл., Украіна — 12.7.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). На фронце з 1941. Камандаваў спец. групай 66-га асобнага атрада Дняпроўскай ваен. флатыліі. У ліп. 1944 дэсантны атрад на чале з малодшым лейт. Ч. высадзіўся на процілеглы бераг р. Прыпяць каля в. Скрыгалаў Мазырскага р-на. Маракі пад агнём праціўніка пераадолелі драцяную загароду і міннае поле, замацаваліся і забяспечылі высадку асн. сіл дэсанта. Ч. загінуў у баі за в. Дарашэвічы Петрыкаўскага р-на. Помнік у в. Дарашэвічы.

ЧАЛЬЧА́К (Lythrum), род кветкавых раслін сям. чальчаковых. Каля 35 відаў. Пашыраны ўсюды. На Беларусі 3 віды Ч.: вербалісты, або плакун-трава (L. salicaria), нар. назвы слёзнік, гарлёўнік, ракавыя шышкі, ляўконія палявая; ісапалісты (L. hyssopifolia) і прутападобны (L. virgatum). Трапляюцца на забалочаных лугах, балотах, у хмызняках, па берагах вадаёмаў.

Адна- і шматгадовыя травяністыя карэнішчавыя расліны, часам кусты. Лісце супраціўнае або кальчаковае. Кветкі ружовыя ці пурпурныя ў коласападобным суквецці або адзіночныя, пазушныя. Плод — каробачка. Лек., меданосныя, дэкар. расліны.

ЧАЛЮ́ШЧАВІЧЫ, вёска ў Петрыкаўскім р-не Гомельскай вобл., на аўтадарозе Капаткевічы—Навасёлкі. Цэнтр сельсавета і камунальнага с.-г. унітар-

нага прадпрыемства. За 40 км на ПнУ ад г. Петрыкаў, 184 км ад Гомеля, 23 км ад чыг. ст. Пціч. 659 ж., 299 двароў (2003). Лясніцтва, дрэваапр. цэх. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў.

ЧАЛЯДЗІ́НСКІ Аляксандр Аляксандравіч (н. 15.7.1944, в. Ашмянцы Мінскага р-на), бел. гісторык, палітолаг. Д-р гіст. н. (1990), праф. (1991). Скончыў БДУ (1968). З 1968 на пед., потым на парт. рабоце. З 1984 заг. кафедры міжнар. адносін Мінскай вышэйшай парт. школы. З 1991 заг. кафедры гісторыі Ін-та павышэння кваліфікацыі пры БДУ, з 1992 праф. кафедры міжнар. адносін БДУ. Даследуе пытанні гісторыі і тэорыі міжнар. адносін, знешняй палітыкі краін Лацінскай Амерыкі. Адзін з аўтараў кн. «Сусветны камуністычны рух на сучасным этапе» (1988).

Тв.: Латиноамериканский фашизм сегодня. Мн., 1984; Демократическая альтернатива фашизму. Мн., 1991; Мировая политика и международные отношения. Мн., 1997 (разам з В.В.Ткачуком); Теория международных отношений. Ч. 1—2. Мн., 1998—2001; Основы дипломатии. Мн., 2002.

ЧАЛЯ́ДНІК, рамеснік у цэхавага майстра ў феад. гарадах Беларусі, Літвы і Польшчы. У большасці статутаў цэхаў бел. гарадоў Ч. называўся работнік, які скончыў курс вучнёўства, але не выканаў усіх патрабаванняў, каб перайсці ў падмайстры. Назва «Ч.» сведчыла, што работнік займае прамежкавую ступень паміж вучнем і падмайстрам і асабіста залежны ад цэхавага майстра. У адрозненне ад падмайстра Ч. атрымліваў плату не на аснове статута цэхаў, а якую дасць майстар. Словамі «Ч.», «чэлядзь» наз. таксама ўсіх работнікаў, што працавалі ў майстра. З 1-й пал. 17 ст. існавала ўнутрыцэхавая арг-цыя Ч. — гаспода. Яна афіцыйна замацоўвалася статутамі цэхаў ці ўласнымі статутамі, абмяжоўвала свавольства майстроў і згуртоўвала Ч. у барацьбе з майстрамі за паляпшэнне эканам. і прававога становішча. На чале гасподы стаяў старшына, выбраны на сходзе Ч.; ён склікаў сходы, вёў рэестр і касу. Сродкі гасподы складаліся з узносаў і штрафаў, выдаткоўваліся на дапамогу і царк. абрады. Гаспода мела некат. судовыя паўнамоцтвы: разбірала скаргі Ч., але яе рашэнні можна было апеляваць да цэхавага суда.

Літ.: Копысский З.Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в. Мн., 1966.

З.Ю.Капыскі.

ЧАМАДУ́РАЎ Яўген Рыгоравіч (н. 28.1.1914, г. Шуміха Курганскай вобл., Расія), бел. мастак тэатра. Засл. дз. маст. Таджыкістана (1945), Літвы (1954), Расіі (1958). Нар. мастак Беларусі (1963). Акад. Пятроўскай акадэміі навук і мастацтваў (1994). Скончыў Ленінградскую АМ (1938). З 1938 працаваў у т-рах Масквы, Душанбе, Чэлябінска, Кіева і інш. У 1959—76 гал. мастак Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі, адначасова ў 1960—91 выкладаў у Бел. тэатр.-маст. ін-це. Творчай манеры ўласцівы відовішчнасць, маштабнасць, эпічная і манумент. выразнасць вобразаў, што дасягаецца спалучэннем графічнай лаканічнасці малюнка з дэкаратыўнасцю колеру, выкарыстанне лепшых традыцый рус. сцэнаграфіі. Глыбокае разуменне прыроды тэатра, рэжысёрскай канцэпцыі спектакля вызначаюць высокі маст. ўзровень сцэнаграфіі да пастановак т-ра оперы і балета: опер «Калючая ружа» (1960), «Калі ападае лісце» (1968), «Зорка Венера» (1970) Ю.Семянякі, «Пікавая дама» П.Чайкоўскага (1960, 1972), «Заручыны ў манастыры» С.Пракоф'ева (1962), «Арэстэя» С.Танеева (1963), «Яснае світанне» А.Туранкова (1964), «Князь Ігар» А.Барадзіна, «Алеся» Я.Цікоцкага, «Брэсцкая крэпасць» К.Малчанава (усе 1967), «Андрэй Касценя» М.Аладава (1970), «Хаваншчына» (1970), «Барыс Гадуноў» (1974) М.Мусаргскага, «Залаты пеўнік» М.Рымскага-Корсакава (1971), «Сельскі гонар» П.Масканьі (1973); балетаў «Мара» (1961), «Альпійская балада» (1967),

Я.**Чамадураў**. Эскіз касцюма воіна да оперы «Арэстэя» С.Танеева.

1 2

Чальчак: 1 — ісапалісты; 2 — вербалісты.

Я.**Чамадураў**. Эскіз дэкарацыі да оперы «Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага.

«Выбранніца» (1969) Я.Глебава, «Папялушка» (1965), «Рамэо і Джульета» (1968) Пракоф'ева, «Лебядзінае возера» Чайкоўскага (1967), «Святло і цені» Г.Вагнера (1963), «Пер Гюнт» на муз. Э.Грыга, «Жызэль» А.Адана (абодва 1966), «Раймонда» А.Глазунова (1972) і інш. У Дзярж. т-ры муз. камедыі Беларусі аформіў аперэты «Сільва» І.Кальмана (1971), «Чацвёрты пазванок» М.Ларні (1973). Аўтар сцэнаграфіі спектакляў «Манон» Ж.Маснэ (1951), «Сарочынскі кірмаш» Мусаргскага (1952) Вял. т-ра ў Маскве, «Аіда» Дж.Вердзі (1955) т-ра оперы і балета Румыніі (Бухарэст), «Сказ пра каменную кветку» Пракоф'ева (1967) Фін. нац. оперы (Хельсінкі), «Барыс Гадуноў» (1975), «Залаты пеўнік» (1979) т-ра «Калон» (Буэнас-Айрэс). Афармляў цыркавыя і эстр. праграмы, масавыя відовішчы. Зняўся ў кінафільмах «Ідучыя за гарызонт», «Рудабельская рэспубліка». Дзярж. прэмія СССР 1949. Іл. гл. таксама да арт. *Касцюм* тэатральны, *Сцэнаграфія*.

Літ.: Карнач П.А. Евгений Чемодуров. Мн., 1984. *І.Л.Чэбан.*

ЧА́МБАЛ, рака ў Індыі, правы прыток р. Джамна. Даўж. 830 км, пл. бас. 135 тыс. км^2. Вытокі на Пн Дэканскага пласкагор'я, у гарах Віндх'я, перасякае плато Малва; ніжняе цячэнне на Інда-Гангскай раўніне. Летнія паводкі. Сярэдні расход вады каля 600 м^3/с. Выкарыстоўваецца для арашэння; буйное вадасховішча каля г. Рампур. ГЭС. Суднаходная на асобных участках. На Ч. — г. Кота.

ЧАМЯЛЫ́НСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА. У Івацэвіцкім р-не Брэсцкай вобл., каля в. Чамялы. Створана ў 1954 у пойме р. Шчара. Пл. 1,26 км^2, даўж. 2,4 км, найб. шыр. 1,25 км, найб. глыб. 1,8 м, аб'ём вады 1,83 млн. м^3. Сярэдні шматгадовы сцёк 375 млн. м^3. Даўж. агараджальнай дамбы 5,1 км. Наліўное: напаўняецца вадой праз шлюзы з Даманаўскага вадасховішча пры дапамозе помпавай станцыі. Выкарыстоўваецца для рыбагадоўлі.

ЧАМЯРЫ́СЫ, вёска ў Брагінскім р-не Гомельскай вобл., на р. Брагінка Верхняя. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 20 км на ПдУ ад г.п. Брагін, 139 км ад Гомеля, 48 км ад чыг. ст. Хойнікі. 505 ж., 212 двароў (2003). Сярэдняя школа-сад, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЧАМЯРЫ́ЦА, возера ў Чашніцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Лукомка (прыток Улы), за 1,5 км на З ад в. Антаполле, за 26 км на ПдУ ад г. Чашнікі. Пл. 0,54 км^2, даўж. 1,52 км, найб. шыр. 460 м, найб. глыб. 2,5 м, даўж. берагавой лініі 3,58 км. Пл. вадазбору 4,2 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу, выцягнута з ПнУ на ПдЗ. Схілы катлавіны выш. 4—7 м, абрываюцца ўступам выш. 1,5—2,5 м, на Пд разараныя, на Пн пад лесам. Берагі нізкія, сплавінныя, парослыя хмызняком, на Пн пад лесам. Пойма затарфаваная і парослая хмызняком, на Пн пад лесам. Дно сапрапелістае, на Пд вузкая паласа пясчаных адкладаў, выслана падводнай расліннасцю. Выцякае ручай у воз. Чарэйскае.

ЧАМЯРЫ́ЦА (Veratrum), род кветкавых раслін сям. лілейных. Каля 50 відаў. Пашыраны пераважна ва ўмераным поясе Паўн. паўшар'я. На Беларусі 1 від — Ч.Лобеля (V. lobelianum). Трапляецца на ўзлесках, вільготных лугах, у поймах рэк, утварае зараснікі.

Шматгадовыя, пераважна буйныя травы з кароткім патоўшчаным карэнішчам. Жывуць каля 50 гадоў, зацвітаюць звычайна на 16—30-ы год жыцця. Лісце шырокаэліпсападобнае, суцэльнакрайняе, складкаватае, на верхняй паверхні мае жалабкі. Кветкі дробныя, ад белых і жаўтавата-зялёных да цёмна-чырв.,

Чамярыца Лобеля.

двухполыя і тычынкавыя ў густых мяцёлках. Плод — шматлістоўка. Усе ч. расліны, асабліва карані і карэнішчы, маюць ядавітыя алкалоіды. Віды Ч. адносяць да самых ядавітых раслін сенажацяў і пашаў. Выклікаюць цяжкія атручэнні ў чалавека і свойскай жывёлы. Выкарыстоўваюць у медыцыне і ветэрынарыі.

ЧАМЯРЫ́ЦКІ Вячаслаў Антонавіч (н. 22.7.1936, в. Рабкі Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. літаратуразнавец, крытык, тэкстолаг, перакладчык. Канд. філал. н. (1967). Скончыў БДУ (1958). З 1958 настаўнік, інспектар Маладзечанскага райаддзела нар. адукацыі, з 1965 у Ін-це л-ры Нац. АН Беларусі (з 1991 заг. аддзела). Даследуе гісторыю бел. летапісання, творчасць і культ.-гіст. ролю пісьменнікаў і дзеячаў бел. культуры эпохі феадалізму. Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» на бел. (т. 1, 1968) і рус. (1977) мовах, кн. «Францыск Скарына» (з Г.Я.Галенчанкам, В.Ф.Шматавым; на франц. 1979; англ. 1980), «Гісторыі сусветнай літаратуры» (т. 3—4, 1985—87), «Нарысаў па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей» (кн. 1, 1993), падручнікаў і дапаможнікаў для ВНУ і інш. Прымаў удзел у выданні «Поўнага збору рускіх летапісаў» (т. 32, 1975; т. 35, 1980), дзе ўпершыню апублікаваў Магілёўскую хроніку, навук.-папулярнага зб. «Беларускія летапісы і хронікі» (1997), складальнік, аўтар прадмовы і каментарыяў да зб. «Слова пра паход Ігаравы» (1986). Дзярж. прэмія Беларусі 1994 за ўдзел у стварэнні цыкла прац «Скарына і беларуская культура».

Тв.: Беларускія летапісы як помнікі літаратуры: Узнікненне і літ. гісторыя першых звадаў. Мн., 1969; Традыцыі літаратуры старажытнай Русі ў беларускай літаратуры: Дакастрычніцкі перыяд. Мн., 1982 (разам з А.Ф.Коршунавым, А.А.Лойкам). *М.І.Аўсяная.*

ЧА́НБА Самсон Якаўлевіч (18.6.1886, с. Атара Ачамчырскага р-на, Абхазія — 1937), абхазскі пісьменнік, дзярж. дзеяч. Скончыў Хонскую настаўніцкую семінарыю (1914). Працаваў настаўнікам, рэдактарам. У 1921—25 і 1930—32 нарком асветы Абхазіі, у 1925—30 старшыня ЦВК Абхазскай АССР, з 1932 у Абхазскім НДІ. Рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны пасмяротна. Пісаў на абхазскай і рус. мовах. Друкаваўся з 1916. Аўтар рамант. паэмы «Дзева гор» (1919), аповесці «Сейдык» (1934), п'ес на гіст. і быт. тэмы «Махаджыры» (1920), «Апсны Ханым» (1923), «З мінулых дзён» (1929), якія заклалі аснову абхазскай нац. драматургіі.

Тв.: Рус. пер. — Избранное. Сухуми, 1960.
Літ.: Лакоба Н. Самсон Чанба: Жизнь и творчество. Сухуми, 1972.

ЧАНБАЙША́НЬ, Чанпэксан, вулканічнае пласкагор'е ў Кітаі і КНДР, самая высокая ч. *Маньчжура-Карэйскіх гор.* Выш. да 2750 (вулк. Пэктусан). Складзена пераважна з базальтаў, глыбока расчлянёнае далінамі рэк Ялуцзян, Маньцзян і Тумыньцзян і іх прытокамі. Хвойныя лясы, зараснікі кедравага сланіку. На тэр. Кітая рэзерват Чанбайшань.

ЧАНГ-ДЫЯЗ (Chang-Diaz) Франклін (н. 5.4.1950, Сан-Хасэ, Коста-Рыка), касманаўт ЗША. Д-р н. у галіне прыкладной фізікі і плазмы (1977). Скончыў ун-т штата Канектыкут (1973), Масачусецкі тэхнал. ін-т. З 1980 у групе касманаўтаў НАСА. Здзейсніў 7 палётаў у складзе экіпажаў касм. караблёў (КК): 12—18.1.1986 і 22.2—9.3.1996 на КК «Калумбія», 18—23.10.1989 і 31.7—8.8.1992 на КК «Атлантыс», 3—11.2.1994 на КК «Дыскаверы», 3—12.6.1998 на КК «Дыскаверы» і арбітальнай станцыі «*Мір*», 6—17.6.2002 на КК «Індэвар» (па праграме работ з Міжнар. касм. станцыяй). У космасе правёў 66,8 сут. 7 медалёў НАСА. *У.С.Ларыёнаў.*

ЧА́НДАР Крышан (19.11.1913, г. Вазірабад, Індыя — 7.3.1977), індыйскі пісьменнік. Скончыў Лахорскі ун-т (1937). Пісаў на мове урду. Першы ра-

ман «Паражэнне» (1944) адметны спалучэннем рэалізму з рамант. ідэалізацыяй тагачаснага жыцця. У раманах «Пяцьдзесят дзве карты» (1956), «Сярэбраная рана» (1964), аповесцях «Дарога вядзе назад» (1961), «Перад другім снегападам» (1967), «Чынары маіх успамінаў» (1968) і інш. лёсы творчай інтэлігенцыі, жыццё сялян і гар. беднаты, надзённыя праблемы інд. рэчаіснасці. Аўтар сатыр. рамана-трылогіі «Прыгоды асла» (1958—65) і інш. На бел. мову асобныя яго апавяданні пераклаў У.Шчасны.

Тв.: Бел. пер. — Выбранае. Мн., 1957; Рус. пер. — Избранное. М., 1955; Мать ветров. М., 1957; Вор. М., 1962; Когда пробудились поля; Чинары моих воспоминаний; Рассказы. М., 1972.

ЧА́НДРА Рамеш (н. 30.3.1919, Лайлпур, Індыя), індыйскі паліт. дзеяч; адзін з кіраўнікоў сусв. *Руху прыхільнікаў міру*. Скончыў Лахорскі (цяпер Пакістан) і Кембрыджскі (Вялікабрытанія) ун-ты. З 1942 ген. сакратар Усеінд. федэрацыі студэнтаў. З 1952 у апараце Камуніст. партыі Індыі, у т.л. чл. Нац. сакратарыята яе Нац. савета, рэдактар газ. «New age» («Новы век»). Ген. сакратар Усеінд. савета міру (1952—63); ген. сакратар (1966—77), прэзідэнт (1977—90), ганаровы прэзідэнт (з 1990) *Сусветнага савета міру*. Узнагароджаны Залатым медалём ААН (1982). Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» 1968.

«ЧА́НДРА» (англ. Chandra), касмічны апарат для пошукаў і даследаванняў крыніц рэнтгенаўскага выпрамянення. Створаны *Нацыянальным кіраўніцтвам па аэранаўтыцы і даследаванні касмічнай прасторы* (НАСА) ЗША. Названы ў гонар С.*Чандрасекара*. Запушчаны 25.7.1999 з амер. пілатуемага касм. карабля «Калумбія». Самы буйны рэнтгенаўскі тэлескоп у свеце: даўж. 11,8 м, дыяметр 4,27 м, агульная маса 5865 кг. Выкарыстоўваецца для вывучэння *чорных дзір*, актыўных ядзер *галактык*, *квазараў*, пошуку скрытай масы Сусвету.

У.С.Ларыёнаў.

ЧАНДРАГУ́ПТА, старажытнаіндыйскі правіцель, заснавальнік дынастыі і дзяржавы *Маур'я* ў 4—3 ст. да н.э.; правіў каля 322 — каля 300 да н.э. (паводле інш. звестак 314—292 ці 290 да н.э.). Схіляў *Аляксандра Македонскага* да паходу на імперыю Нандаў. Пасля адыходу грэч. войск з Індыі (325 да н.э.) перамог Джана Нанду і захапіў уладу ў дзяржаве *Магадха*. Падпарадкаваў тэр. Паўн. Індыі і паводле дагавора з *Селеўкам I Нікатарам* (каля 305 да н.э.) далучыў да сваіх уладанняў раёны сучасных Белуджыстана і Усх. Афганістана. Пры Ч. пачалі развівацца гандл., культ. і дыпламат. сувязі Індыі з эліністычнымі краінамі Азіі і Міжземнамор'я.

Літ.: Бонгард-Левин Г.М. Индия эпохи Маурьев. М., 1973.

ЧАНДРАСЕКА́Р (Chandrasekhar) Субрахманьян (19.10.1910, г. Лахор, Індыя, цяпер у Пакістане — 21.8.1995), амерыканскі астрафізік-тэарэтык. Чл. Каралеўскага астр. т-ва (1933), Лонданскага Каралеўскага т-ва (1944), Нац. АН ЗША (1955). Скончыў Мадраскі (1930) і Кембрыджскі (1933) ун-ты. З 1936 у ЗША. З 1937 у Чыкагскім ун-це (у 1937—64 у Йеркскай абсерваторыі). Навук. працы па ўнутр. будове і дынаміцы зорак, радыяцыйным пераносе,

С.Чандрасекар.

У.А.Чантурыя.

гідрадынамічнай і гідрамагнітнай устойлівасці, агульнай тэорыі адноснасці. Даказаў існаванне гранічнай масы для белых карлікаў (1931), пасля перавышэння якой пачынаецца *гравітацыйны калапс*. Распрацаваў тэорыю зорак з ізатэрмічным ядром (тэорыя Ч. — Шонберга, 1942). Даследаваў механізмы пераносу і рассеяння выпрамянення ў планетных атмасферах (тэорыя Козырава — Ч., 1934; эфект Собалева — Ч., 1946). Нобелеўская прэмія 1983 (з У.А.*Фаўлерам*). Нац. навук. медаль ЗША (1966). Яго імем названы малая планета і касм. рэнтгенаўская абсерваторыя «*Чандра*», запушчаная НАСА у 1999.

Тв.: Рус. пер. — Принципы звездной динамики. М., 1948; Введение в учение о строении звезд. М., 1950; Перенос лучистой энергии. М., 1953; Эллипсоидальные фигуры равновесия. М., 1973; Жидкие кристаллы. М., 1980; Математическая теория черных дыр. Ч. 1—2. М., 1998. *М.М.Касцюковіч.*

ЧАНДЫГА́РХ, горад на ПнЗ Індыі, каля падножжа Гімалаяў. Адм. ц. штатаў Пенджаб і Хар'яна, а таксама аднайм. саюзнай тэрыторыі. 575 тыс. ж. (1991). Прам-сць: хім., машынабудаванне. Ун-т. Пабудаваны ў 1951—56 паводле праекта інд. і замежных архітэктараў на чале з *Ле Карбюзье*.

ЧАН КАЙШЫ́, Цзян Цзешы, Цзян Чжунчжэн (31.10.1887, в. Сікоку, прав. Чжэцзян, Кітай — 5.4.1975), кітайскі дзяржаўны і ваенны дзеяч. Генералісімус (пасля 1927). Скончыў ваен. курсы ў г. Баадзін (Кітай) і пях. вучылішча ў Токіо. З 1908 у рэв. арг-цыі *Тунмэнхой*. З часу *Сіньхайскай рэвалюцыі 1911—13* паплечнік *Сунь Ятсена* і адзін з кіраўнікоў *Гаміньдана*. Адзін з кіраўнікоў узбр. сіл ва ўрадзе Сунь Ятсена, з 1926 галоўнакаманд. Нац.-рэв. арміяй; адначасова з 1926 лідэр Гаміньдана. Кіраўнік *Паўночнага паходу 1926—28*, у выніку якога Кітай аб'яднаны пад уладай Гаміньдана. З таго часу галоўнакаманд. ўзбр. сіламі Кіт. Рэспублікі і яе фактычны кіраўнік (з 1943 прэзідэнт). З канца 1920-х г. вёў амаль няспынную барацьбу з камуністамі. Кіраваў *Нацыянальна-вызваленчай вайной кітайскага народа супраць японскіх захопнікаў 1937—45*. Пацярпеў паражэнне ад камуністаў у новай грамадз. вайне (1946—49), эвакуіраваўся з рэшткамі войск на в-аў *Тайвань*, якім кіраваў да канца жыцця як прэзідэнт Кітая. У 1950—60-я г. ініцыіраваў эканам. рэформы, якія ператварылі Тайвань ў адзін з найб. развітых рэгіёнаў Азіі.

Літ.: Галенович Ю.М. Цзян Чжунчжэн, или Неизвестный Чан Кайши. М., 2000. *В.У.Адзярыха.*

ЧАНСТАХО́ВА (Częstochowa), горад на Пд Польшчы. 259 тыс. ж. (1992). Трансп. вузел. Прам-сць: металургічная, маш.-буд., тэкст. (шарсцяная, ільняная), харч., папяровая, мэблевая. Арх. помнікі 15—18 ст., у т.л. кляштар ордэна паўлінаў (17—18 ст., у касцёле — абраз «Чанстахоўская Божая Маці», 14 ст.).

ЧАНСТАХО́ЎСКАЕ ВАЯВО́ДСТВА (Województwo Częstochowskie), былая адм.-тэр. адзінка на Пд Польшчы. З 1999 у складзе *Шлёнскага ваяводства*.

ЧАНТУ́РЫЯ Уладзімір Аляксандравіч (28.6.1923, Баку — 28.11.1988), бел. архітэктар, гісторык архітэктуры, педагог. Д-р архітэктуры (1965), праф. (1968). Скончыў Азербайджанскі індустр. ін-т (1947). У 1947—49 у ін-це «Белдзяржпраект» у Мінску, з 1953 выкладчык БПІ (з 1969 заг. кафедры). Аўтар праектаў дэталёвай планіроўкі гіст. цэнтраў Гродна (1970) і Віцебска (1972, абодва ў сааўт.). Пад яго кіраўніцтвам праведзены абмеры помнікаў бел. дойлідства (1954—70) і абследаванне гіст. забудовы бел. гарадоў (1971—82). Працы па гісторыі бел. архітэктуры: «Архітэктура Беларусі канца XVIII — пачатку XIX ст.» (1962), «Архітэктурныя помнікі Беларусі» (1982), «Помнікі архітэктуры і горадабудаўніцтва Беларусі» (1986). Дзярж. прэмія Беларусі 1980.

Тв.: Атлас памятников архитектуры и мемориальных комплексов Белоруссии. Мн., 1983; История архитектуры Белоруссии. Т. 1. 3 изд. Мн., 1985; Белоруссия, Литва, Латвия, Эстония. Мн., 1986 (у сааўт.).

Літ.: Воинов А.П., Воинов А.А. Устремленность // Стр-во и архитектура Белоруссии. 1983. № 3.

ЧАНЧЖО́Ў, Уцзінь, горад ва ўсх. ч. Кітая, у прав. Цзянсу. 531,5 тыс. ж. (1990, з прыгарадамі). Трансп. вузел і порт на *Вялікім канале*. Прам-сць: машынабудаванне (лакаматывы, трактары, дызелі), металургічная, тэкст., хімічная.

ЧАНЧУ́НЬ, горад у паўн.-ўсх. ч. Кітая, на р. Ітунхэ. Адм. ц. прав. Гірын. Узнік у пач. 19 ст.; пасля пабудовы Кітайскай Чанчуньскай чыгункі (1897—1903) — буйны гандл.-трансп. цэнтр. 2,9 млн. ж. (2000). Прам-сць: машынабудаванне (трансп. сродкі, пераважна аўтамабілі, станкі, радыётэхніка, аптычныя прылады, радыёэлектроніка), хім. (шыны, пластмасы, угнаенні, лякарствы), тэкст., харч., дрэваапрацоўчыя. Вытв-сць буд. матэрыялаў. Саматужныя промыслы (дыванаткацтва і інш.). Філіял АН. Ун-т.

ЧАНША́, горад у цэнтр. ч. Кітая, на р. Сянцзян. Адм. ц. прав. Хунань. Адзін са стараж. гарадоў краіны (пасяленні на месцы сучаснага Ч. вядомы з 5 ст. да н.э.). 1,1 млн. ж. (1990). Трансп. вузел. Порт на р. Сянцзян. Цэнтр развітага с.-г. (рыс. і інш.) раёна. Прам-сць: лёгкая, харч.; вытв-сць сталі, алюмінію, станкоў, эл. і прамысл. абсталявання, вагонаў, угнаенняў. Буйны рынак рысу.

ЧАНЫ́, Вялікія Чаны, бяссцёкавае саленаватае возера ў Барабінскім стэпе, у Новасібірскай вобл. Расіі. Пл. 1708—2269 км^2 (залежыць ад сезонных і гадавых ваганняў узроўню). Глыб. да 10 м. Складаецца з 4 плёсаў. Берагі моцна парэзаныя, 60 астравоў. Злучана пратокай з воз. Малыя Ч. Рыбалоўства. Суднаходства.

ЧАПА́ЕЎ Васіль Іванавіч (9.2.1887, в. Будайка, цяпер у межах г. Чэбаксары Чувашскай Рэспублікі — 5.9.1919), савецкі военачальнік. У 1-ю сусв. вайну на Паўд.-Зах. фронце, фельдфебель (1916); узнагароджаны 4 Георгіеўскімі крыжамі. Пасля ранення з вясны 1917 у

В.І.Чапаеў.

запасных вайск. часцях. З 1917 чл. РСДРП(б). Са снеж. 1917 камандзір запаснога палка, са студз. 1918 ваен. камісар Нікалаеўскага пав. Саратаўскай губ. З мая 1918 камандзір пях. брыгады, з вер. нач. 2-й Нікалаеўскай дывізіі; вёў баі супраць уральскіх казакоў і часцей чэхаславацкага корпуса. У ліст. 1918 — студз. 1919 у Ваен. акадэміі Генштаба РСЧА, потым камандаваў Аляксандраўгайскай групай войск на Усх. фронце. З сак. 1919 нач. 25-й стралк. дывізіі, якая ў крас.—ліп. 1919 вызначылася ў баях супраць войск А.В.Калчака за гарады Бугуруслан, Белебей, Уфа, разблакіравала г. Уральск; узнагароджаны ордэнам Чырв. Сцяга (1919). Загінуў у баі ў час раптоўнага нападу праціўніка на штаб дывізіі ў Лбішчанску (цяпер г. Чапаеў, Казахстан) на р. Урал. Яго імя як таленавітага нар. палкаводца яшчэ пры жыцці было авеяна славай і легендамі. Папулярызацыі яго вобраза паспрыялі раман Дз.А.*Фурманава* «Чапаеў» (1923) і аднайм. маст. фільм (1934, рэж. *Васільевы*). Яму пастаўлены помнікі ў Самары, Чэбаксарах, Чапаеве. Імя Ч. было прысвоена 25-й стралк. дывізіі; на Беларусі названы вуліцы, калгасы і саўгасы; у яго гонар у гады Вял. Айч. вайны на Беларусі яго імя насілі 7 партыз. брыгад і дзесяткі атрадаў.

Літ.: В.И.Чапаев. Чебоксары, 1979; Легендарный начдив: Сб. док. Чебоксары, 1986.

М.Г.Нікіцін.

ЧАПА́ЕЎСКІ, пасёлак у Верхнядзвінскім р-не Віцебскай вобл., на паўд.-ўсх. беразе Асвейскага возера. Да 1958 в. Красілаўка. Цэнтр сельсавета. За 36 км на ПнУ ад горада і чыг. ст. Верхнядзвінск, 191 км ад Віцебска. 11 ж., 6 двароў (2003). Магіла ахвяр фашызму. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. На паўд. ускраіне Ч. гарадзішчы 1-га тыс. н. э.

ЧАПЕ́ГА Уладзімір Пятровіч (н. 18.6.1939, в. Сялец Брагінскага р-на Гомельскай вобл.), бел. перакладчык. Скончыў Мінскі пед. ін-т замежных моў (1961), Данецкае вышэйшае ваен.-паліт. вучылішча інж. войск і войск сувязі (1973). У 1962—88 у Сав. Арміі. Жыве ў Германіі. Друкуецца з 1971. На ням. мову пераклаў раман «Людзі на балоце» І.Мележа (1974, з Г.Чапегай, Г.Бярозкам), аповесці «Абеліск» (1975) і «Здрада» (1978) В.Быкава, «Раданіца» А.Кудраўца (1983, усе з Чапегай, Н.Рандавым), кн. «Зямля пад белымі крыламі» У.Караткевіча (1983), «Танец з вужакамі» А.Разанава (2002, з Э.Эрб), асобныя творы Я.Коласа, Цёткі, М.Гарэцкага, Я.Брыля, К.Крапівы, П.Галавача, М.Зарэцкага, Я.Скрыгана, В.Каваля, Л.Калюгі, Я.Нёманскага, Н.Артымовіч, кнігі для дзяцей В.Віткі, А.Якімовіча, «Беларускія народныя казкі» (1986, усе з Чапегай). На бел. мову з ням. пераклаў раманы «Пара ў дарогу, буслы» Г.Ота (1982, з Я.Семяжонам), «Апасіяната» А.Аменды (1983), «Ісусавы вучні» Л.Франка (1989, абодва з Чапегай), «Пякучая таямніца» С.Цвэйга (1994) і інш.

У.Л.Сакалоўскі.

ЧА́ПЕК (Čapek) Іосеф (23.3.1887, г. Гронаў, Чэхія — красавік 1945), чэшскі жывапісец, графік, пісьменнік. Вучыўся ў Маст.-прамысл. школе ў Празе, у Парыжы. Друкаваўся з 1907 разам з братам К.*Чапекам*. У 1910—20-я г. супрацоўнічаў з газетамі і часопісамі. У выяўл. мастацтве звяртаўся да прыёмаў кубізму, фавізму і прымітывізму. Аўтар жывапісных работ («Чалавек з мяшком»,

К.Чапек.

1926; цыклы «Агонь», «Мара», абодва 1938—39), ілюстрацый да твораў чэш. пісьменнікаў, у т.л. да раманаў К.Чапека «Фабрыка Абсалюту» (1922), «Кракаціт» (1924) і ўласных твораў («Аповесць пра сабачку і кошачку», 1929), антыфаш. карыкатур і інш. Загінуў у канцлагеры.

ЧА́ПЕК (Čapek) Карал (9.1.1890, Малеє-Сватанёвіцы, Чэхія — 25.12.1938), чэшскі пісьменнік. Скончыў Пражскі ун-т (1915). Друкаваўся з 1907. Зведаў уплыў філасофіі рэлятывізму і прагматызму (трактат «Прагматызм, ці Філасофія прагматычнага жыцця», 1917). У зб-ках апавяд. «Распяцце» (1917), «Пакутлівыя апавяданні» (1921) і інш. пошук крытэрыю ісціны, роздум над філас. праблемамі. Сусв. вядомасць прынеслі напісаныя ў жанры антыутопіі сац.-фантаст. п'есы «R.U.R.» (1920), «Сродак Макрапуласа» (1922), раманы «Фабрыка Абсалюту» (1922), «Кракаціт» (1924). Філас. пераадоленне рэлятывізму ў раманетрылогіі «Гардубал», «Метэор» і «Звычайнае жыццё» (1933—34). Вяршыня яго творчасці — раман «Вайна з саламандрамі» (1936), у якім сатыра на мілітарызм, фаш. расавыя тэорыі. Антыфаш. і антываен. накіраванасць і пошукі ідэалу «цэльнага чалавека» ў аповесці «Першая выратавальная» (1937) і п'есах «Белая хвароба» (1937), «Маці» (1938). Аўтар кніг дарожных нататкаў, зборнікаў гумарыст. апавяданняў і нарысаў, твораў для дзяцей і інш. На бел. мову яго асобныя творы пераклалі Я.Курто, А.Чаркасаў. На бел. сцэне паводле аднайм. п'ес Ч. пастаўлены спектаклі «Сродак Макрапуласа» (1983, Дзярж. рус. драм. т-р), «Разбойнік» (1997).

Тв.: Бел. пер. — Казкі і вясёлыя гісторыі. Мн., 1997; Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—7. М., 1974—77.

Літ.: Никольский С.В. Карел Чапек — фантаст и сатирик. М., 1973; Малевич О.М. Карел Чапек: Критико-биогр.

очерк. 2 изд. М., 1989; Карел Чапек в воспоминаниях современников: Пер. с чеш. М., 1990; Токсина И.В. Карел Чапек: Биобиблиогр. указ. М., 1959. *А.У.Вострыкава.*

ЧАПЕ́ЦЬ, 1) у беларусаў круглая шапачка з фабрычнай тканіны або вязаная з ільняных ці баваўняных нітак; састаўная частка галаўнога ўбору замужніх жанчын. Наз. таксама чэпік. Ч. накладалі на абручык-тканку ці жмут кудзелі і сцягвалі ззаду матузком, налобную ч. аздаблялі вышыўкай. Зверху завязвалі

Жанчыны ў **чапцах**. Вёска Аброва Іванцэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. 1930-я г.

намітку ці хустку. У наш час Ч. носяць некат. пажылыя жанчыны на Палессі. 2) Галаўны ўбор дзіцяці, круглая шапачка з вушкамі. Аздабляўся вышыўкай, нашыўкамі фальбаваных стужак, тасёмак, карункамі вакол ілба. 3) У многіх мясцовасцях Беларусі тое, што *каптур*. *М.Ф.Раманюк.*

ЧАПКО́ Валянціна Уладзіміраўна (н. 25.2.1925, Мінск), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (1969), праф. (1976). Скончыла БДУ (1950). З 1953 у Ін-це гісторыі АН БССР, з 1972 заг. кафедры ў Мінскім пед. ін-це. З 1978 у БДУ: заг. кафедры гісторыі БССР, з 1984 праф. кафедры гісторыі стараж. свету і сярэдніх вякоў. Даследуе сац.-эканам. працэсы ў Беларусі ў 1-й пал. 19 ст. Адзін з аўтараў прац «Гісторыя Беларускай ССР» (т. 2, 2-е выд. 1961), «Гісторыя Мінска» (1967), «Гісторыя Беларускай ССР» (т. 1, 1972), «Полацк: Гіст. нарыс» (2-е выд. 1987). Адзін са складальнікаў зб. дакументаў «Беларусь у эпоху феадалізму» (т. 3—4, 1961—79).

Тв.: Беларускі першадрукар Георгій Скарына. Мн., 1956; Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в. Мн., 1966; Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX в. Мн., 1972; Города Белоруссии в первой половине XIX в.: (Экон. развитие). Мн., 1981; Историография БССР. Эпоха феодализма. Мн., 1986 (разам з З.Ю.Капыскім).

ЧАПКЯЛЯ́Й, запаведнік у Літве, у бас. р. Нямунас (Нёман). Засн. ў 1975 для аховы унікальных лясных балот і азёр, рэліктавай флоры і фауны забалочаных лясоў. Пл. 8,5 тыс. га. Глебы балотныя вярховага тыпу. Каля 70% тэр. пад балотамі (вярховыя, пераходныя, нізінныя), пакрытымі лясамі. Сярод балот 21 невял. возера. Дамінуюць хвойнікі (80,5%); 12% бярэзнікаў, 5,5% алешнікаў, 2% ельнікаў. У флоры 654 віды вышэйшых раслін, з іх 58 рэдкія, у Чырв. кнізе арніка горная, пылкагалоўнік чырвоны, чаравічак сапраўдны, надбароднік бязлісты, зубянка клубняносная. У фауне 64 віды млекакормячых, у т.л. лось, дзік, казуля, бабёр, андатра. 156 відаў птушак (у Чырв. кнізе чорнаваллёвая гагара, чорны бусел, лугавы мышалоў, асаед, змеяед, малы падворлік, арлан-белахвост, скапа, пустальга, шэры журавель, турухтан і інш.); 7 відаў рэптылій, 9 — земнаводных, каля 2 тыс. — насякомых.

ЧА́ПЛІ, птушкі сям. чаплевых атр. буслападобных. 3 роды (Ardea, Egretta, Bubulcus), 24 віды. Пашыраны ва ўмеранай, субтрапічнай і трапічнай абласцях. Жывуць каля вадаёмаў. На Беларусі 5 відаў Ч.: белая вялікая (E. alba), рыжая (A. purpurea), занесеныя ў Чырв. кнігу; белая малая (E. garzetta), егіпецкая (B. ibis) — выпадкова залётныя віды; шэрая (A. cinerea) — пашыраны від, нар. назва каня, валяваха. Ч. жаўтадзюбая (E. eulophotes) жыве ў Карэі, Кітаі, магчыма, у Прымор'і, занесена ў Чырв. кнігу МСАП.

Даўж. цела каля 1 м, маса да 2,3 кг (Ч. шэрая). Апярэнне шэрае, чыста белае, чорнае, жоўтае, цёмна-рыжае або каштанавае. На патыліцы невял. чубок, знізу шыі пёры звісаюць грывай. Ад ніжняй ч. спіны адыходзяць 2 пучкі рассуканых пёраў (эгрэтак), якія закрываюць хвост. Ногі і шыя доўгія. Дзюба прамая, вострая, доўгая. Нясуць 3—8 яец.

У запаведніку **Чапкяляй**.

Чаплі: 1 — вялікая белая; 2 — малая белая; 3 — рыжая; 4 — шэрая.

Кормяцца буйн. насякомымі і іх лічынкамі, дробнымі млекакормячымі, рыбай, жабамі, паўзунамі. *Э.Р.Самусенка.*

ЧА́ПЛІН, археалагічны комплекс (гарадзішча, селішча, бескурганны і курганныя могільнікі) каля в. Чаплін Лоеўскага р-на Гомельскай вобл. Гарадзішча 7—6 ст. да н.э. — 13 ст. н.э. На ім выяўлена больш за 20 раннезарубінецкіх заглыбленых у зямлю жытлаў пл. 10—24 м^2. Знойдзены прылады працы (сярпы, нажы, сякеры-кельты), узбраенне (наканечнікі коп'яў, латэнская шпора), упрыгожанні (посахападобныя бронзавыя і жал. шпількі, бранзалеты, кольцы), гліняныя прасліцы розных тыпаў і форм, грузікі, пацеркі, накрыўкі і шарыкі, вырабленыя з косці і рогу вастрыі і амулеты, тачыльныя камяні, таўкачы, зерняцёркі, бронзаліцейныя формачкі і тыглі, вырабы з бронзы і інш. Выяўлены таксама розныя тыпы скіфскіх рэчаў, кельцкія фібулы, стараж.-грэч. шкляныя пацеркі, абломкі эліністычнага посуду, фрагмент збанка *чарняхоўскай культуры*, косці свойскіх і дзікіх жывёл, рыб, птушак. Селішча адносіцца да *мілаградскай культуры*, *зарубінецкай культуры* і перыяду Кіеўскай Русі. На ім выяўлены рэшткі заглыбленых у зямлю і наземных жытлаў слупавой канструкцыі розных перыядаў, вял. гасп. ямы. Знойдзены вырабы з жалеза (нажы, наканечнікі коп'яў, стрэл, кручкі, сяродналатэнскія фібулы), бронзы (кольца з выступамі, завушніцы, посахападобныя шпількі), керамічны посуд, патэльні, прасліцы, каменныя брускі, зерняцёркі, касцяныя праколкі, шкляныя пацеркі і інш. Бескурганны могільнік адначасовы селішчу ранняга перыяду. У ім знойдзены 275 пасудзін, 14 жал. наканечнікаў коп'яў, некалькі дзесяткаў падковападобных, а таксама латэнскіх жал. фібул з Цэнтр. Еўропы, жал. нажы, сякеры-кельты, гліняныя прасліцы, упрыгожанні з бронзы і жалеза, 1164 шкляныя пацеркі стараж.-грэч. паходжання і інш. Пахавальны абрад — трупаспаленне. *Курганныя могільнікі* эпохі Кіеўскай Русі насыпаны на тэр. селішча жал. веку. Знойдзена кераміка зарубінецкай культуры. *Л.Д.Побаль.*

ЧА́ПЛІН (Chaplin) Чарлі (Чарлз Спенсер; 16.4.1889, Лондан — 25.12.1977), амерыканскі акцёр, кінарэжысёр, сцэнарыст, прадзюсер. З 1895 (паводле інш. звестак з 1897) выступаў у мюзік-холе і т-ры пантамімы. У 1914 дэбютаваў у ЗША як акцёр, рэжысёр, сцэнарыст. Спалучаў акцёрскі талент з бліскучай клоунскай тэхнікай. Стварыў вядомую трагічную кінамаску «маленькага чалавека» — бадзягі Чарлі («Бадзяга», 1915; «Ціхая вуліца», «Імігрант», абодва 1917, і інш.). Герой Ч. арганічна існаваў у жанрах трагіфарсу («На пля́чо!», 1918), меладрамы («Малыш», 1921). У 1923 засн. уласную фірму «Чарлз С.Чаплін філм карпарэйшэн». Пасля фільма «Парыжанка» (1923, без удзелу Ч. як акцёра) зноў звярнуўся да вобраза Чарлі. Непаўторная творчая індывідуальнасць Ч. прынесла поспех стужкам «Залатая ліхаманка» (1925), «Цырк» (1928), «Агні вялікага горада» (1931) і інш. Стварыў антыфаш. сатыр. фільм «Вялікі дыктатар» (1940). Пасля горкай прытчы «Месье Верду» (1947) паставіў фільм «Агні рампы» (1952, прэмія «Оскар» за музыку 1972), у якім выступіў як рэжысёр, сцэнарыст, акцёр і кампазітар. З 1953 у Еўропе. У Вялікабрытаніі паставіў фільмы «Кароль у Нью-Йорку» (1957), «Графіня з Ганконга» (1967). Пра яго мастацтва зняты біягр. фільм «Чарлі» (1992). Спец. прэміі «Оскар» 1928, 1972. Залатая прэмія на Міжнар. кінафестывалі ў Венецыі 1972 за творчасць.

Ч.Чаплін у фільме «Агні вялікага горада».

Тв.: Рус. пер. — Моя биография. М., 1966.
Літ.: Кукаркин А.В. Чарли Чаплин. М., 1960; Садуль Ж. Чарли Чаплин: Пер. с фр. М., 1981. *Г.У.Шур.*

ЧАПЛЫ́ГІН Сяргей Аляксеевіч (5.4.1869, г. Раненбург, цяпер г. Чаплыгін Ліпецкай вобл., Расія — 8.10.1942), расійскі вучоны ў галіне тэарэт. механікі, стваральнік навук. школы па гідра- і аэрамеханіцы. Акад. АН СССР (1929, чл.-кар. 1924). Герой Сац. Працы (1941). Засл. дз. нав. РСФСР (1929). Скончыў Маскоўскі ун-т (1890), выкладаў у ім і інш. ВНУ Масквы. З 1901 праф., з 1905 дырэктар Маскоўскіх вышэйшых жаночых курсаў. З 1918 у Цэнтр. аэрагідрадынамічным ін-це (ЦАГІ, у 1928—31 дырэктар-начальнік). Навук. працы па гідрамеханіцы, матэматыцы, аналіт. механіцы, аэрамеханіцы, авіяцыі, балістыцы. Прапанаваў метад даследавання газавых струмянёў пры дагукавых скарасцях, што стала пачаткам развіцця газавай дынамікі. Выказаў пастулат аб вызначэнні велічыні цыркуляцыі скорасці патоку вакол крыла (пастулат Ч. — Жукоўскага), што дазволіла рашаць задачы аб сілах дзеяння патоку на абцякальнае цела. Яго імем названы кратэр на адваротным баку Месяца.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—4. М.; Л., 1948—50; Избранные труды. М., 1976.
Літ.: С.А.Чаплыгин: Материалы к науч. биогр. М., 1972.

ЧА́ПСКІ, Гутэн-Чапскі Эмерык Карлавіч (Эмерык Захар'яш Мікалай Севярын; 17.11.1828, в. Станькава Дзяржынскага р-на Мінскай вобл. — 23.7.1896), дзяржаўны дзеяч, калекцыянер. Чл. Рус. археал. т-ва (1851), Маскоўскага нумізматычнага т-ва (1890). З роду *Чапскіх*. Скончыў Маскоўскі ун-т. З 1851 у Мін-ве ўнутр. спраў, з 1863 наўгародскі губернатар, пасля дырэктар Ляснога дэпартамента Мін-ва дзярж. маёмасцей. З 1861 міравы пасрэднік Мінскага пав. У 1879 пакінуў дзярж. службу і жыў у Станькаве. Заснаваў Станькаўскі музей Эмерыка Чапскага, дзе зберагаліся манеты, медалі, зброя, творы мастацтва, гіст. дакументы, кнігі і інш. Аўтар кн. «Удзельныя, велікакняжацкія і царскія грошы Старажытнай Русі збору Э.К.Гутэн-Чапскага» (1875), «Каталог калекцыі польскіх медалёў і манет графа Э.Гутэн-Чапскага» (т. 1—5, 1871—1916). Працы Ч. адзначаны вял. сярэбраным медалём Рус. археал. т-ва, у гонар 25-годдзя яго навук. працы ў 1896 выбіты медаль. У 1894 падзяліў свае маёнткі Станькава і Прылукі паміж сынамі і пераехаў у Кракаў, куды перавёз музейныя зборы (цяпер у складзе Нац. музея). Гл. таксама *Станькаўскі сядзібна-паркавы ансамбль*.

А.І.Валаховіч.

ЧА́ПСКІЯ, Гутэн-Чапскія, шляхецкі род герба «Ляліва» ў ВКЛ і Рас. імперыі. Лічылі сябе выхадцамі з Прусіі. Першы дакументальна вядомы прадстаўнік роду — Марцін, якому вял. князь Жыгімонт I Стары ў 1526 пацвердзіў права на валоданне маёнткам Чаплі (адсюль прозвішча). Карысталіся графскім тытулам. Мелі маёнткі ў Германіі, Аўстрыі, Польшчы, на Украіне. На Беларусі ў 19 — пач. 20 ст. Ч. належалі Станькава, Прылукі, Негарэлае і інш. ў Мінскім пав., Нарушчавічы, Свяцічы ў Навагрудскім пав., Ганцавічы, Началяхоўская ў Слуцкім пав. Найб. вядомыя: Францішак Станіслаў Костка (1725—9.4.1802), сын Ігнацыя, кашталяна гданьскага. Хэлмінскі падкаморы з 1752, кашталян з 1762, ваявода ў 1766—72. У выніку шлюбу з Веранікай, дачкой М.К.*Радзівіла* Рыбанькі (1772), атрымаў у пасаг Станькава і Вязань з навакольнымі вёскамі. Кароль (Кароль Юзаф Патрыцы Ігнацы Клеменс Геранім; 1778—1836), сын Францішка Станіслава Косткі. Шамбялян (камергер) караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Ганаровы куратар (папячыцель) школ Слуцкага пав. (1811). У час вайны 1812 пасля адступлення рас. войск увайшоў у склад створанай у Мінску камісіі часовага кіравання, потым дырэктар скарбовага аддзела адміністрацыі Мінскага дэпарта-

мента. Пасля разгрому войск Напалеона I эміграваў, даставіў у Кракаў касу *Часовага ўрада Вялікага княства Літоўскага*. Пасля амністыі вярнуўся на Беларусь. У 1808 і 1816 быў выбраны маршалкам шляхты Мінскага пав. Чл. масонскай ложы «Дасканалае адзінства» ў Вільні. Чл. Адукацыйнай камісіі ў Вільні (1820). Валодаў Станькавам у Мінскім пав., Жупранамі ў Ашмянскім пав. Станіслаў (1779—1844), сын Францішка Станіслава Косткі. У вайну 1812 змагаўся на баку Напалеона I як камандзір 22-га пях. палка *Літоўскіх войск 1812* (разбіты пад Новым Свержанем і ў Койданаве). Удзельнічаў у Бярэзінскай аперацыі 1812, кампаніі 1813. Эміграваў у Парыж. Эдвард (10.6.1819, фальварак Заполле Слуцкага пав. — 27.1.1888), сын Станіслава. З 1842 на службе ў Дзярж. сакратарыяце Каралеўства Польскага, потым у Пецярбургу і

С.А.**Чаплыгін**.

Э.К.**Чапскі**.



Да арт. **Чапскія**: К.Э.Чапскі.

Варшаве. У час *паўстання 1863—64* выконваў загады паўстанцкіх улад. У чэрв. 1863 арыштаваны і прыгавораны да смяротнага пакарання, заменянага ссылкай у Сібір. Аўтар мемуараў. Адам (1819—?), сын Караля. Камер-юнкер рас. імператарскага двара, калежскі саветнік. Валодаў маёнткамі Навасёлкі, Жупраны, Маляты ў Віленскай губ., Наруцавічы, Нача ў Мінскай губ. 24.6.1874 яму і братам Каралю Ігнацыю і Эмерыку нададзены графскі тытул. Эмерык Карлавіч (17.11.1828—23.7.1896), гл. *Чапскі* Э.К.Карл Эмерыкавіч (Кароль Ян Аляксандр; 27.8.1860; в. Станькава — 30.1.1904), сын Эмерыка Карлавіча. У 1890—1901 гар. галава ў Мінску. Яго намаганнямі ў горадзе адкрыты трамвай-конка (1892), электрастанцыя (1895), тэлефонная станцыя агульнага карыстання (1896), ламбард, начныя прытулкі, шпіталі, амбулаторыі; праводзіліся добраўпарадкаванне, электрычнае асвятленне і інш. Садзейнічаў адкрыццю ў Мінску Т-ва аматараў спорту (1892, яго старшыня), Т-ва аховы жанчын (1901), гар. крэдытнага т-ва (1901), чл. Мінскага т-ва сельскай гаспадаркі. Меў маёнткі ў Мінскім і Ігуменскім пав., піваварны з-д у Мінску. Марыя (6.2.1894, в. Станькава — 10.6.1981), дачка Юрыя Эмерыкавіча. Гісторык, літаратар. Д-р філасофіі (1928). Вучылася ў Варшаўскім і Кракаўскім ун-тах. Пасля 2-й сусв. вайны ў Парыжы. Вывучала гісторыю Рэфармацыі ў Рэчы Паспалітай, літаратуру перыяду рамантызму. Аўтар кн. «Людвіка Снядэцкая» (1938, 2-е выд. 1958). У кн. «Еўропа ў сям'і» (1970, 2-е выд. 1989) дала шмат звестак з жыцця Эмерыка Ч., дэталёва апісала маёнтак Станькава. Эмерык (25.8.1897, в. Станькава — 31.1.1979), сын Карла Эмерыкавіча. Гісторык. У Зах. Беларусі старшыня Саюза землеўласнікаў. У 1930 і 1935 быў выбраны паслом у сейм. З 1939 у эміграцыі, працаваў у польскіх дзярж. установах. Даследаваў сувязі Рэчы Паспалітай з Італіяй. Сабраў багатую калекцыю старых карт Польшчы і ВКЛ, ініцыятар выдання «Каталога старых карт Польскай Рэчы Паспалітай у калекцыі Эмерыка Гутэн-Чапскага і іншых зборах» (1978).

Літ.: Валаханович А.И., Кулагин А.Н. Дзержинщина: Прошлое и настоящее. Мн., 1986. *А.І.Валаховіч.*

ЧАПУКІ́, вёска ў Новапагосцкім с/с Міёрскага р-на Віцебскай вобл., на аўтадарозе Міёры—Шаркаўшчына. Цэнтр калгаса. За 14 км на З ад Міёраў, 204 км ад Віцебска, 12 км ад чыг. ст. Міёры. 51 ж., 27 двароў (2003). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЧА́ПУНЬКА, Шылве, рака ў Іўеўскім р-не Гродзенскай вобл., правы прыток р. Бярэзіна (бас. Нёмана). Даўж. 38 км. Пл. вадазбору 311 км^2. Пачынаецца каля г.п. Юрацішкі, упадае ў Бярэзіну за 2,5 км на ПдУ ад в. Чапунь. Прытокі: Гарача, Сіма, Вярэнка. Даліна ў сярэднім і ніжнім цячэнні — невыразная. Пойма забалочаная, большая ч. асушана. Рэчышча на працягу 28 км ад вытоку каналізаванае, шыр. ў нізоўі да 12 м.

ЧАПЫ́ГІН Аляксей Паўлавіч (17.10.1870, в. Вял. Вугал Каргапальскага р-на Архангельскай вобл., Расія — 21.10.1937), рускі пісьменнік. Друкаваўся з 1903. Аповесці «Белы скіт» (1913), зб. «Па звярынай сцежцы» (1918) пра жыццё дарэв. Расіі. У гіст. раманах «Разін Сцяпан» (ч. 1—3, 1926—27), «Гуляшчыя людзі» (ч. 1—4, 1935—37) рамантызацыя нар. стыхіі, сілы, бунтарства. Аўтар аповесці «Жыццё маё» (1929), апавяданняў, п'ес, нарысаў, артыкулаў пра літ. творчасць і інш.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—5. Л., 1967—69.

Літ.: Семенов В.С. Алексей Чапыгин. М., 1974.

ЧАПЯЛІ́, вёска ў Салігорскім р-не Мінскай вобл., каля аўтадарогі Слуцк—Мікашэвічы. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 9 км на ПнЗ ад горада і чыг. ст. Салігорск, 125 км ад Мінска. 490 ж., 240 двароў (2003). Сярэдняя школа-сад, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЧА́РА, рака ў Чыцінскай, Іркуцкай абласцях і Якуціі (Расія), левы прыток р. Алёкма (бас. р. Лена). Даўж. 851 км, пл. бас. 87,6 тыс. км^2. Пачынаецца на паўд. схіле хр. Кодар, цячэ па Чарскай катлавіне, перасякае хр. Кодар, утвараючы парог. Паводка з мая па верасень. Сярэдні расход вады 900 м^3/с. Суднаходства на 416 км ад вусця. У бас. Ч. адзінае ў свеце радовішча *чараіту*.

ЧАРАБА́САЎСКІ КАНА́Л, Чарабасаўка, меліярацыйны канал у Лунінецкім р-не Брэсцкай вобл., левы прыток р. Прыпяць. Даўж. 32,2 км. Пачынаецца з Агараджальнага канала за 7,5 км на У ад в. Чырвоная Воля, вусце за 2 км на ПдУ ад в. Намакрава.

ЧАРАДЗЕ́ЙНЫЯ КА́ЗКІ, жанравая разнавіднасць казачнага эпасу; *казкі* з тыповымі сюжэтамі, матывамі, будовай, дзе прысутнічаюць чарадзейства, незвычайныя героі, змагаюцца сілы дабра і зла, але заўсёды перамагае справядлівасць. Міжнар. паказальнікі казачных сюжэтаў адносяць Ч.к. да «ўласна казак». У іх аснове міфічнае светаўспрыманне, адметная сістэма вобразаў, у якой звычайна супрацьпастаўлены асілкі, іх памочнікі і іх ворагі, што ўвасабляюць варожыя людзям сілы. Існуюць розныя схемы класіфікацыі і падзелу Ч.к. на сюжэтна-тэматычныя групы. Першая група аб'ядноўвае казкі героіка-фантаст. зместу, творы маштабныя, прасякнутыя пафасам барацьбы з варожымі народу сіламі (*Цмок*, *Кашч* і інш.). Іх гал. героі асілкі — змагары за праўду, справядлівасць, абаронцы пакрыўджаных (*Кацігарошак*, *Івашка Мядзведжае Вушка*, *Іван Удовін сын*). У другую групу ўваходзяць Ч.к., пабудаваныя на сямейных калізіях. Яны маюць шмат агульных рыс у змесце, сістэме вобразаў, паэтыцы. Важнае месца ў гэтых казках займае матыў здабывання чарадзейнай жонкі, з дапамогай якой герой пазбаўляецца галечы і помсціць свайму крыўдзіцелю («Няшчасны егар», «Іван Васілевіч стралок» і інш.). Да гэтай групы адносяцца казкі, у якіх маст. вобразы звязаны з татэмістычнымі вераваннямі («Царэўна-жаба», «Сястрыца Алёнушка і брацец Іванушка», «Рак-царэвіч»), а таксама казкі пра бязвінна пакрыўджаных сірот. Да трэцяй групы адносяцца Ч.к., што адлюстравалі нар. ўяўленні аб праўдзе, крыўдзе, горы, лёсе, смерці, якія персаніфікуюцца, дапамагаюць раскрыць іх глыбінны сэнс.

Узніклі ў дакласавы і раннекласавы перыяд грамадства, што характарызуецца моцнай за-

лежнасцю чалавека ад навакольнай прыроды, розныя з'явы якой ён адухаўляў, надзяляў уласнымі гіпербалізаванымі якасцямі. На гэтай ступені развіцця грамадскай свядомасці розным народам уласціва міфалагізаванне, г.зн. бессвядома-маст. перапрацоўка прыроды і грамадскіх адносін у фантазіі і пры дапамозе фантазіі. *Міфалогія* склала светапоглядную аснову Ч.к., фантастыка якіх адпавядала агульнаму ўзроўню грамадскай свядомасці, таму абапіралася на элементы *татэмізму*, *анімізму*, *фетышызму* і інш. вераванняў старажытнасці. Маст. выдумка казак не адрывалася ад жыцця. У многіх з іх увасоблены малюнкі сял. працы, якую героі самі або з дапамогай цудоўных памочнікаў робяць вельмі хутка, прыгожа і вынікова. Аднак сувязь прац. пачатку і мастацтва не з'яўляецца непасрэднай і прамалінейнай, і чым больш казка аддаляецца ад сваіх вытокаў, тым больш апасродкаваны характар яна набывае.

У бел. Ч.к. сюжэтны склад налічвае каля 220 сюжэтных тыпаў і падтыпаў. Большасць з іх міжнар., аднак ёсць сюжэты, выяўленыя толькі ў бел. фальклоры: «Рука-невідзімка і тры сястры», «Меч-самасек і жана-ведзьма» і інш. Найб. пашыраны Ч.к. «Тры царствы», «Бой на калінавым мосце», «Дзівосныя дзеці» і інш. Часта ў адным творы аб'ядноўваюцца 2 і больш сюжэтаў, утвараючы адзінае маст. цэлае. Напр., асн. сюжэт пра асілкаў-змееборцаў часам ускладняецца сюжэтамі «Цудоўныя памочнікі», «Сіўка-Бурка» і інш.

Публ.: Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі. Мн., 1971; Чарадзейныя казкі. Ч. 1—2. Мн., 1973—78.

Літ.: Пропп В.Я. Исторические корни волшебной сказки. Л., 1946; Бараг Л.Р. Беларуская казка. Мн., 1969; Новиков Н.В. Образы восточнославянской волшебной сказки. Л., 1974; Казкі ў сучасных запісах. Мн., 1989; Народная проза. Мн., 2002.

К.П.Кабашнікаў.

ЧАРАДНІЧЭ́НКА Ніна Данілаўна (н. 7.11.1947, в. Лісава Нараўлянскага р-на Гомельскай вобл.), бел. спявачка (1-ы альт). Засл. арт. Беларусі (1997). Скончыла Магілёўскае культ.-асв. вучылішча (1972). З 1969 у Дзярж. акад. нар. хоры імя Г.Цітовіча. Валодае прыгожым выразным голасам шырокага дыяпазону, сцэн. культурай. Выканаўца (сола і ў дуэце) многіх твораў бел. кампазітараў, нар. бел., рус. і ўкр. песень.

ЧАРАДНІЧЭ́НКА Уладзімір Ільіч (3.10.1930, с. Архангельскае Слаўгарадскага р-на Алтайскага краю, Расія — 12.3.1994), бел. кампазітар. Скончыў Бел. кансерваторыю (1958, кл. А.*Багатырова*). З 1959 выкладчык Мінскага муз. вучылішча імя М.Глінкі. У 1964—66 дырыжор-кансультант эстр. калектываў бел. філармоніі. Творам Ч. ўласцівы меладызм, эмацыянальная выразнасць і пранікнёнасць, дасканалая форма. Аўтар 2 сімфоній (1959, 1985); уверцюр «Веснавая» (1964) і «Святочная» (1968) для сімф. арк.; сюіты (1964) і канцэрта для баяна (1967) з арк. нар. інструментаў; кам.-інстр. музыкі, раманса для валторны і фп. (1964), хароў, музыкі да кінафільмаў і інш.

Дз.М.Жураўлёў.

ЧАРАІ́Т (назва ад р. *Чара*), мінерал падкласа ланцужковых сілікатаў, складаны сілікат K, Na, Ca, Ba, Mn, змяшчае ваду і фтор. Хім. формула дакладна не высветлена. Адкрыты ў 1977 на Мурунскім шчолачным масіве ва Усх. Сібіры. Сінганія, верагодна, манаклінная, крышт. структура канчаткова не расшыфравана. Утварае валакністыя масы і доўгаслупковыя агрэгаты розных адценняў фіялетавага колеру. Цв. 5,5. Шчыльн. 2,5—2,6 г/см^3. Паходжанне гідратэрмальна-метасаматычнае, утвараецца ў шчолачных сіенітах. Каштоўны ювелірна-вырабны і калекцыйны камень. Адзінае ў свеце радовішча — Бэзавы камень ва Усх. Сібіры (Расія).

Ваза з **чараіту**.

ЧАРАМІ́СІНАВА Людміла Дзмітрыеўна (н. 20.12.1947, г. Ленінск-Кузнецкі Кемераўскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне тэхн. кібернетыкі і інфарматыкі. Д-р тэхн. н. (2001). Скончыла Томскі ун-т (1971). З 1972 у Ін-це тэхн. кібернетыкі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па аўтаматызацыі лагічнага праектавання дыскрэтных кіравальных прыстасаванняў у машынабудаванні і мікраэлектроніцы. Распрацавала мадэлі, метады, алгарытмы апаратнай і праграмнай рэалізацыі прылад лагічнага кіравання ў сучасных мікраэлектронных базісах.

Тв.: Использование факторизации при синтезе многоуровневых сетей на программируемых логических интегральных схемах // Весці Нац. АН Беларусі. Сер. фіз.-тэхн. навук. 2000. № 2; Двудольная сверка ПЛМ // Докл. Нац. АН Беларуси. 2001. Т. 45, № 2.

М.П.Савік.

ЧАРАМША́, мядзведжая цыбуля (Allium ursinum), кветкавая расліна сям. цыбулевых. Пашырана ў Еўропе, Міжземнамор'і, М. Азіі. Занесена ў Чырв. кнігу Беларусі. Трапляецца ў лясах, паблізу рэк, ручаёў і балот, утварае зараснікі. Культывуецца.

Шматгадовая травяністая цыбулевая расліна выш. да 40 см. *Эфемероід*. Цыбуліна падоўжанай формы, таўшчынёй каля 1 см, штогод узнаўляецца, мае смак *часнаку*. Сцябло 3-граннае, у ніжняй частцы з 2 (3) шырокімі завостранымі лістамі. Кветкі белыя, буйныя, у негустым парасоніку на верхавінцы кветаноса. Плод — каробачка. Ранняй вясной ліс це Ч. мае вітаміну С у 10—15 разоў больш за лімон, спажываецца ў ежу. Лек., харч., дэкар., меданосная расліна.

ЧАРАМШЫ́НА Марка (сапр. Семанюк Іван Юр'евіч; 13.6.1874, с. Кабакі Косаўскага р-на Івана-Франкоўскай вобл., Украіна — 25.4.1927), украінскі пісьменнік. Д-р юрыд. н. (1906). Скончыў Венскі ун-т (1901). З 1912 адвакат у г. Снятын. Першае апавяд. «Кормчы» (1896) пра жыццё плытагонаў. Для ранніх твораў характэрны ўплыў мадэрнізму (цыкл вершаў у прозе «Лісткі», 1898), для больш позніх — крытычнага рэалізму (цыкл навел з жыцця гуцульскіх сялян у зб. «Карбы», 1901). Аўтар зб-каў навел «Сяло гіне» (1925), «Верхавіна» (выд. 1929). На бел. мову некат. яго творы пераклаў В.Рабкевіч.

Тв.: Бел. пер. — Апавяданні. Мн., 1982; Рус. пер. — Избранное. М., 1973.

ЧАРАНКАВА́ННЕ, спосаб *вегетатыўнага размнажэння* раслін з дапамогай *чаранка*. Выкарыстоўваюць у пладаводстве, дэкар. садаводстве, лесаводстве і інш. Сцябловымі чаранкамі размнажаюць парэчкі, агрэст, таполю, вярбу, чубушнік; каранёвымі чаранкамі — маліну, некат. сарты вішні, слівы; лісцевымі чаранкамі — бягонію, расходнік, узумбарскую фіялку. Працэс утварэння каранёў пры Ч. многіх раслін стымулююць рэгулятарамі росту.

ЧАРАНКЕ́ВІЧ Сяргей Мікалаевіч (н. 20.7.1942, в. Палянічыцы Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. фізік і біяфізік. Д-р біял. н. (1989), праф. (1990). Скончыў БДУ (1964), дзе і працуе (з 1979 заг. кафедры). Навук. працы па бія-

Чарамша.

фізіцы клетак, спектраскапіі біяпалімераў, біячыпах, клетачнай інфарматыцы, малекулярнай медыцыне. Распрацаваў тэорыю сігнальнай ролі актыўных форм кіслароду ў клетках, выявіў люмінесцэнтныя ўласцівасці нуклеінавых к-т і ліпідаў. Дзярж. прэмія Беларусі 2000.

Тв.: Агрегация тромбоцитов: методы изучения и механизмы. Мн., 1990 (разам з А.Б.Самаль, Н.Ф.Хмарай); Фотобиология и мембранная биофизика. Мн., 1999 (у сааўт.); Chemiluminescence at the turn of the millenium — an indispensable tool in modern chemistry, biochemistry and medicine. Dresden, 2000 (у сааўт.). *П.М.Бараноўскі.*

ЧАРАНКО́ВА—ВАВІ́ЛАВА ВЫПРАМЯНЕ́ННЕ, эфект Вавілава—Чаранкова, выпрамяненне святла (адрознае ад люмінесцэнцыі), якое ўзнікае пры руху электрычна зараджанай часціцы ў асяроддзі са скорасцю, большай за фазавую скорасць святла ў гэтым асяроддзі. Выяўлена П.А.*Чаранковым* у эксперыментах, пастаўленых па прапанове С.І.*Вавілава*, пры даследаванні γ-люмінесцэнцыі растворaў (1934). Тэорыя Ч.—В.в. створана І.Я.*Тамам* і І.М.*Франкам* (1937). Ч.—В.в. і тэарэт. ўяўленні, якія ляжаць у яго аснове, выкарыстоўваюцца ў ядз. фізіцы (гл. *Чаранкоўскі лічыльнік*), фізіцы плазмы, тэорыі паскаральнікаў і інш. *А.І.Болсун.*

ЧАРАНКО́Ў Павел Аляксеевіч (28.7.1904, с. Новая Чыгла Варонежскай вобл., Расія — 6.1.1990), расійскі фізік. Акад. АН СССР (1970, чл.-кар. 1964). Герой Сац. Працы (1984). Скончыў Варонежскі ун-т (1928). З 1930 у Фіз. ін-це АН СССР, адначасова з 1948 праф. Маскоўскага энергет. ін-та і з 1951 — Маскоўскага інж.-фіз. ін-та. Навук. працы па фіз. оптыцы, ядз. фізіцы і фізіцы касм. прамянёў, паскаральнай тэхніцы. Эксперыментальна выявіў новую фіз. з'яву (гл. *Чаранкова—Вавілава выпрамяненне*), на аснове якой распрацаваў ме-

П.А.Чаранкоў.

тады рэгістрацыі зараджаных часціц (гл. *Чаранкоўскі лічыльнік*). Прымаў удзел у распрацоўцы і стварэнні першых сінхратронаў. Дзярж. прэміі СССР 1946, 1952, 1977. Нобелеўская прэмія 1958 (з І.Я.*Тамам* і І.М.*Франкам*).

Тв.: Нобелевские лекции. М., 1960 (разам з І.Я.Тамам, І.М.Франкам).

ЧАРАНКО́ЎСКІ ЛІЧЫ́ЛЬНІК, дэтэктар зараджаных часціц, дзеянне якога заснавана на рэгістрацыі *Чаранкова—Вавілава выпрамянення*. Складаецца з радыятара (рэчыва, у якім рухаецца часціца), аптычнай сістэмы для факусіроўкі святла і аднаго ці некалькіх *фотаэлектронных памнажальнікаў*, што ператвараюць светлавы сігнал у электрычны. Выкарыстоўваецца ў ядз. фізіцы і фізіцы часціц высокіх энергій.

ЧАРАНО́К, частка расліны, якая выкарыстоўваецца пры *вегетатыўным размнажэнні*. Нарыхтоўваюць Ч. з высакаякасных мацярынскіх раслін. Адрозніваюць Ч. сцябловыя (зімовыя і зялёныя), лісцевыя і каранёвыя. Пры пэўных умовах вырошчвання на сцябловых Ч. утвараюцца карані, на каранёвых — пупышкі, на лісцевых — і пупышкі, і карані. Расліна, што ўтвараецца з Ч., захоўвае якасці і ўласцівасці мацярынскай расліны. Гл. таксама *Чаранкаванне*.

ЧАРАПАВЕ́Ц, горад у Валагодскай вобл. Расіі, на Волга-Балтыйскім водным шляху. Засн. ў 1777. 323,3 тыс. ж. (2001). Порт на р. Волга (Рыбінскае вадасх.). Чыг. станцыя. Прам-сць: чорная металургія, хім. (мінер. ўгнаенні), машынабудаванне (вытв-сць суднаў, аўтаспецабсталявання, суднарамонт), дрэваапр. (мэбля, фанера, запалкі), лёгкая (трыкат., швейная). Пед. ін-т. Музеі: краязнаўчы і В.В.*Верашчагіна*. Арх. помнікі: Васкрасенскі сабор (1752, у 19 ст. перабудаваўся), 2-павярховыя купецкія дамы і асабнякі (19 ст.).

ЧАРАПАВЕ́ЦКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА, другая назва *Шэкснінскага вадасховішча* на р. Шэксна.

ЧАРАПА́НАВЫ, расійскія механікі-вынаходнікі, бацька і сын (з г. Ніжні Тагіл): Яфім Аляксеевіч (1774 — 27.6.1842) і Мірон Яфімавіч (1803 — 17.10.1849). Прыгонныя заводчыкаў Дзямідавых, атрымалі вольную. Яфім Ч. стварыў майстэрню пры Выйскім з-дзе (цяпер г. Ніжні Тагіл). З 1822 гал. механік усіх ніжнетагільскіх з-даў. Мірон Ч. з 1819 прызначаны памочнікам бацькі, з 1842 замяніў яго. Ч. ўдасканалілі абсталяванне доменнай, жалезаапрацоўчай, медзеплавільнай і інш. вытв-сцей. Пабудавалі каля 20 паравых машын. У 1833—34 стварылі першы ў Расіі паравоз.

Літ.: Виргинский В.С. Жизнь и деятельность русских механиков Черепановых. М., 1956.

ЧАРАПА́ХІ (Testudines, або Chelonia), атрад паўзуноў. Вядомы з трыясу, узніклі ад *катылазаўраў*. Вылучаюць 2 (зрэдку 5) падатр.: *бакашыйныя чарапахі* з 2 сям. (*змеяшыйныя чарапахі* і *пеламедузавыя*) і *скрыташыйныя чарапахі* з 8 сям. (*марскія чарапахі, сухапутныя чарапахі*, Ч. кайманавыя, мяккацелыя, прэснаводныя, скурыстыя і інш.). Каля 250 сучасных відаў. Іх падзяляюць на марскіх і наземных (сухапутныя і прэснаводныя). Марскія пашыраны ў трапічных і субтрапічных зонах акіянаў, наземныя — паўсюдна (акрамя Антарктыды). Жывуць у пустынях, трапічных лясах, у азёрах, рэках, балотах, на марскіх узбярэжжах, у акіянах і г.д. 38 відаў і падвідаў у Чырв. кнізе МСАП. На Беларусі 1 від — *балотная чарапаха*, занесеная ў Чырв. кнігу.

Даўж. панцыра ад 10 см да 2,4 м, маса да 865 кг. Панцыр касцёва-рагавы або касцёва-скурысты, складаецца са спіннога (карапакс) і брушнога (пластрон) шчытоў. У многіх Ч. пад панцыр уцягваюцца галава, хвост і канечнасці. Зубоў няма, сківіцы ўкрыты рагавымі пласцінкамі ў выглядзе дзюбы. Размнажаюцца на сушы яйцамі. Наземныя Ч. кормяцца пераважна раслінаасцю, водныя — жывёльным кормам. Жывуць некалькі дзесяткаў (зрэдку да 150) гадоў. Асобныя віды — аб'екты промыслу. Іл. гл. таксама да арт. *Бакашыйныя чарапахі, Балотныя чарапахі, Марскія чарапахі, Пеламедузавыя, Сухапутныя чарапахі.*

Чарапахі: 1 — кайманавая; 2 — каспійская; 3 — міжземнаморская; 4 — скурыстая; 5 — слановая; 6 — чырванавухая.

Літ.: Жизнь животных. Т. 5. 2 изд. М., 1985; Земноводныя. Паўзуны: Энцыкл. давед. Мн., 1996. *Э.Р.Самусенка.*

ЧАРАПА́ШКІ, клапы-чарапашкі, шчытнікі-чарапашкі (Scutelleridae), сямейства насякомых атр. паўцвердакрылых. Каля 600 відаў. Шкоднікі збожжавых культур, асабліва жыта і пшаніцы. Найб. вядомая *шкодная чарапашка*. На Беларусі 4 віды. Найб. пашыраны Ч. аўстрыйская (Eurygaster austriacus) і маўрская (E. maura).

1 2

Чарапашкі: 1 — аўстрыйская; 2 — маўрская.

Даўж. 3,5—13 мм. Цела пукатае, авальнае, зрэдку прадаўгаватае, брудна-жоўтае, бурае, чорнае, з мармуровым малюнкам. Пярэднеспінка хіцінізаваная, ззаду яе пукаты шчыток, укрывае большую ч. надкрылаў, нагадвае панцыр чарапах (адсюль назва). Лапкі 3-члянікавыя, 2 пары крылаў. Ротавыя органы колюча-сысучыя. Развіццё з няпоўным ператварэннем. Расліннаедныя. Зімуюць дарослыя асобіны, радзей лічынкі. Іл. гл. таксама да арт. *Шкодная чарапашка.* *С.Л.Максімава.*

ЧАРАПА́ШЫЯ АСТРАВЫ́, архіпелаг у Ціхім ак.; тое, што *Галапагас.*

ЧАРАПЕ́ЦКАЕ ВО́ЗЕРА, Чарпецкае возера, Чарпет, у Расонскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Нішча, за 2 км на ПнУ ад в. Глаты, за 6 км на Пн ад г.п. Расоны. Пл. 2,03 км^2, даўж. 5,45 км, найб. шыр. 940 м, найб. глыб. 5 м, даўж. берагавой лініі 14,8 км. Пл. вадазбору 194 км^2. Катлавіна лагчыннага тыпу, складанай лопасцевай формы, выцягнута з З на У. Схілы катлавіны на Пн і З выш. 2—4 м, на Пд 5—9 м, на У да 15 м, пераважна пад лесам. Берагі нізкія, пясчаныя або затарфаваныя, на ПнУ зліваюцца са схіламі. Месцамі на Пн і Пд пойма шыр. 30—200 м, забалочаная і ўкрытая хмызняком. Мелкаводдзе пясчанае, глыбей дно сапрапелістае. Зарастае да глыб. 2,5—3 м. Праз возера цячэ р. *Чарапяціца*, якая злучае яго з азёрамі Мыленскае, Валькоўскае. Упадае р. Рудня і 2 ручаі.

ЧАРАПІ́ЦА, дахоўка, штучны *дахавы матэрыял* у выглядзе пласцін (жалабатых, плоскіх, фальцавых і інш.) з абпаленай гліны ці з цэментава-пясчаных растворaў. Гліняная Ч. — адзін з найдаўнейшых дахавых матэрыялаў; вядома за 2700 г. да н.э. Вырабляюць Ч. пераважна пазавую (штампаваная і стужачная), плоскую (стужачная) і вільчыкавую.

Пазавая Ч. мае пазы (фальцы) і выступы (грабяні), з дапамогай якіх шчыльна перакрываюцца стыкі. Гліняную Ч. вырабляюць з легкаплаўкіх глін, больш пластычных, чым для цэглы; фармуюць і абпальваюць пры т-ры 1000—1100 °С.

ЧАРАПНЁЎ Сяргей Міхайлавіч (1.9.1918, в. Шніткі Сенненскага р-на Віцебскай вобл. — 14.6.1944), Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў Мелітопальскае ваен. авіявучылішча штурманаў (1940). У Вял. Айч. вайну штурман авіяэскадрыллі капітан Ч. да ліп. 1943 зрабіў 237 начных баявых вылетаў на бамбардзіроўку аб'ектаў у тыле ворага (разбурыў 4 пераправы, 2 чыг. вузлы, спаліў 7 складоў, 5 самалётаў, 11 танкаў, 37 аўтамашын) і 94 вылеты для забеспячэння сав. войск боепрыпасамі і гаручым, раскідаў больш за 5 млн. лістовак. Загінуў каля г. Дэмблін (Польшча).

ЧАРАПНІ́Н Леў Уладзіміравіч (12.4.1905, г. Разань, Расія — 12.6.1977), савецкі гісторык. Акад. АН СССР (1972). У 1925 здаў экзамены за універсітэцкі курс. Выкладаў у Маскоўскім ун-це і інш. ВНУ. З 1946 у Ін-це гісторыі АН СССР. Праф. (1947). Даследаваў перыядызацыю рас. гісторыі эпохі феадалізму, сацыяльна-эканам. і паліт. гісторыю стараж.-рус. грамадства 10—13 ст., развіццё саслоўна-прадстаўнічай манархіі і абсалютызму ў Расіі. Аўтар прац па крыніцазнаўстве і гістарыяграфіі. Дзярж. прэмія СССР 1981.

Тв.: Русская палеография. М., 1956; Русская историография до XIX в. М., 1957; Образование русского централизованного государства в XIV—XV вв. М., 1960; Новгородские берестяные грамоты как исторический источник. М., 1969; Земские соборы русского государства в XVI—XVII вв. М., 1978.

ЧАРАПНІ́Н Мікалай Мікалаевіч (15.5.1873, С.-Пецярбург — 27.6.1945), расійскі кампазітар, дырыжор, педагог. Скончыў пецярбургскія ун-т (1895) і кансерваторыю (1898, кл. М.*Рымскага-Корсакава*). З 1902 дырыжыраваў канцэртамі Рус. муз. т-ва, «Рус. сімф. канцэртамі» і інш. У 1906—09 у Марыінскім т-ры. У 1909—14 удзельнік «Рускіх сезонаў» за мяжой. Адначасова ў 1905—18 выкладаў у Пецярбургскай кансерваторыі (з 1909 праф.). З 1918 дырэктар Тбіліскай кансерваторыі. З 1921 у Францыі. Адзін з заснавальнікаў і дырэктар Рус. кансерваторыі ў Парыжы (1925). Для творчасці характэрны традыцыі рус. муз. класікі, уплывы імпрэсіянізму. Сярод твораў: опера «Ванька-Ключнік» (паст. 1932), балеты «Павільён Арміды» (паст. 1907) і «Нарцыс і Эха» (паст. 1911); сімф. творы для арк., у т.л. «Прынцэса Мроя» (1896), сімф. паэма «Мар'я Марэўна» (1909); камерныя інстр. і вак. творы, хары, рамансы (каля 100) і інш. Сярод вучняў А.*Гаўк*, С.*Пракоф'еў*, Ю.*Шапорын*.

Тв.: Воспоминания музыканта. Л., 1976.

ЧАРАПУ́К Янка (Іван Антонавіч; псеўд. Янка Змагар; 24.8.1896, мяст. Новы Двор Падляскага ваяв., Польшча — 16.11.1957), бел. паліт. дзеяч. Скончыў мужчынскую гімназію Відэмана ў Пецярбургу (1914), вучыўся ў Пецярбургскім ун-це. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 ініцыятар стварэння ў Пецярбургу грамадскай культ.-асв. арг-цыі «Вольныя беларусы», сакратар Пецярбургскага прадстаўніцтва (місіі) Цэнтр. Укр. рады. Пазней у Кіеве, супрацоўнік Мін-ва замежных спраў Укр. Нар. Рэспублікі, чл. Бел. рады на Украіне, ініцыятар стварэння партыі бел. незалежных рэвалюцыянераў. З канца 1918 на Гродзеншчыне, чл. Бел. партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р). Удзельнік Бел. з'езда Віленшчыны і Гродзеншчыны (ліп. 1919), сакратар Цэнтр. бел. рады Віленшчыны і Гродзеншчыны. Друкаваўся ў газ. «Беларусь» і «Родны край» (Гродна), «Наша думка». З канца 1919 у Рызе, сакратар вайскова-дыпламат. місіі БНР у Латвіі і Эстоніі, адначасова дыпламат. кур'ер пры ўрадзе БНР на чале з А.Луцкевічам. У снеж. 1919 кааптаваны ў склад Рады БНР, пасля яе паліт. расколу прыхільнік урада В.Ластоўскага. Як паўнамоцны прадстаўнік БПС-Р і прадстаўнік урада БНР удзельнічаў у канферэнцыях бел. сац. партый (крас. 1920) і бел. дзярж. і грамадскіх дзеячаў (чэрв. 1920) у Рызе. У жн. 1920 узначальваў дэлегацыю БНР на міждзярж. канферэнцыі балт. дзяржаў. У 1921 сакратар дыпламат. місіі БНР у Каўнасе, уваходзіў у ініцыятыўную «тройку» па стварэнні Загранічнага к-та БПС-Р. Удзельнік 1-й Усебел. канферэнцыі ў Празе (1921). З 1922 у эміграцыі ў ЗША, актыўны ўдзельнік грамадска-паліт. жыцця бел. дыяспары, ініцыятар стварэння шэрагу бел.-амер. арг-цый.

Я.**Чарапук.**

У.В.Ляхоўскі.

ЧАРАПЯ́ЦІЦА, Чарапеціца, рака ў Расонскім р-не Віцебскай вобл., левы прыток р. Нішча (бас. р. Зах. Дзвіна). Даўж. 22 км. Пл. вадазбору 359 км^2. Выцякае з воз. Межава (у вярхоўі рака называецца Межава) за 500 м на У ад в. Межава. Цячэ ў межах Нешчардаўскага ўзв. і Полацкай нізіны, праз азёры Мыленскае, Чарапецкае і Валькоўскае. Вусце за 3 км на ПнУ ад в. Юхавічы.

ЧАРАЎНІ́К (Platanthera), род кветкавых раслін сям. архідных. Больш за 50 (паводле інш. звестак 200) відаў. Пашыра-

Чараўнік зеленакветкавы.

ны ў Паўн. паўшар'і. На Беларусі 2 віды Ч.: двухлісты, або начная фіялка (P. bifolia), і зеленакветкавы (P. chlorantha), занесены ў Чырв. кнігу. Трапляюцца на ўзлесках, у лясах, хмызняках.

Шматгадовыя травяністыя расліны з 2 падоўжанымі каранёвымі клубнямі, выш. да 70 см. Лісце (1—2) пры аснове або пасярэдзіне сцябла буйное, эліпсападобнае, тупое, звужанае ў крылаты чаранок, вышэй па сцябле — 1—5 дробных ланцэтных лісцікаў. Кветкі дробныя, белыя або зеленавата-белыя, сабраныя ў рэдкую гронку, звычайна з прыемным пахам, які ўзмацняецца бліжэй да ночы і перад дажджом. Плод — каробачка. Высушаныя клубні выкарыстоўваюць у медыцыне (салеп). Лек., дэкар. расліны.

«ЧАРАЎНІЦЫ», бел. жаночы эстрадна-харэаграфічны ансамбль. Створаны ў 1976 у Мінску пры Мін-ве гандлю Беларусі, з 1989 прафесійны. Маст. кіраўнікі і гал. балетмайстары Р.Красоўская і М.Красоўскі (да 1989). У сваёй творчасці калектыў спалучае эстр. кірунак з класічным танцам. У рэпертуары харэаграфічныя мініяцюры на муз. П.Чайкоўскага, «Балеро» М.Равеля, «Іспанскае капрычыо» М.Рымскага-Корсакава, танцы ў стылі мадэрн; вальсы, полькі, маршы І.Штрауса і інш. У розныя часы сярод салістаў ансамбля Н.Вашкевіч, Н.Крывенка, С.Разумава, В.Раткевіч, Т.Шаўно. У 1976—89 пры ансамблі існавала школа-студыя. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1985.

ЧАРАХО́ЎСКАЯ Раіса Львоўна (н. 1.5.1916, г. Адэса, Украіна), украінская і рас. артыстка балета, бел. дзяячка самадз. мастацтва, педагог. Засл. работнік культуры Беларусі (1982). Скончыла Адэскі музычна-тэатр. тэхнікум (1933). З 1934 салістка балета Адэскага і Новасібірскага т-раў оперы і балета, Омскай філармоніі, педагог-балетмайстар Маскоўскага т-ра імя Я.Вахтангава. У 1956—91 арганізатар і маст. кіраўнік Мінскай дзіцячай нар. балетнай студыі «Мара» пры Палацы культуры Белсаўпрофа. Аўтар і пастаноўшчык харэаграфічных кампазіцый, танцаў, дзіцячых балетаў у студыі «Мара», лібрэта балета «Альпійская балада» Я.Глебава. Сярод вучняў І.*Душкевіч*.

Тв.: Танцевать могут все. Мн., 1973.

ЧАРАЦЯ́НКА, вёска ў Гомельскім р-не. Цэнтр сельсавета. За 55 км на ПдУ ад Гомеля, 12 км ад чыг. ст. Краўцоўка. 569 ж., 194 двары (2003). Базавая школа-сад, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — Успенская царква (1865—68). Каля вёскі гарадзішча.

ЧАРАЦЯ́НКІ (Acrocephalus), род птушак сям. валасянкавых атр. вераб'інападобных. 27 відаў. Пашыраны ў Еўразіі, Афрыцы, Аўстраліі. Жывуць у хмызняках і зарасніках чароту, трысняту па берагах вадаёмаў, радзей у лясах ці садах. На Беларусі 6 відаў. Найб. пашыраны Ч.: балотная (A. palustris), барсучок (A. schoenobaenus), дроздападобная (A. arundinaces). Ч. вяртлявая (A. paludicola) занесена ў Чырв. кнігу.

Даўж. да 21 см, маса да 35 г (Ч. дроздападобная). Апярэнне зверху рыжавата-бурае, знізу белае з бурым адценнем. Дзюба доўгая, вострая, каля яе асновы шчацінкі. Нясуць 3—6 яец. Кормяцца насякомымі і іх лічынкамі, павукамі, чарвямі, дробнымі малюскамі.

Э.Р.Самусенка.

Чарацянкі: 1 — балотная; 2 — барсучок; 3 — вяртлявая; 4 — дроздападобная.

ЧАРБАМЫ́СЛА, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Зах. Дзвіна, за 4 км на ПнУ ад в. Вялікае Сітна, за 48 км на ПнУ ад Полацка, у межах гідралаг. заказніка *Глыбокае-Чарбамысла*. Пл. 0,5 км², даўж. 1,3 км, найб. шыр. 510 м, найб. глыб. 6,9 м, даўж. берагавой лініі 3,2 км. Пл. вадазбору 2 км².

Катлавіна лагчыннага тыпу, авальная, выцягнутая з ПнУ на ПдЗ. Схілы катлавіны на Пн і З выш. 15—20 м, на У да 8 м, пад хваёвым лесам, на Пд да возера прымыкае верхавое балота. Берагі высокія, на З, Пн і У зліваюцца са схіламі, пясчаныя, на Пд тарфяныя. Дно да глыб. 1,5—2 м выслана пяском і апясчаненым ілам, ніжэй сапрапелем. На глыб. да 2 м расце рэдкі ахоўны від — палушнік азёрны, да 4—4,5 м імхі. Ёсць пасяленні баброў, водзяцца ракі.

ЧАРВАКО́Ў Васіль Фёдаравіч (4.4.1894, с. Канабеева Разанскай вобл., Расія — 3.1.1976), бел. і рас. вучоны ў галіне судовай медыцыны. Д-р мед. н. (1935), праф. (1936). Засл. дз. нав. РСФСР (1955). Скончыў Маскоўскі ун-т (1917). З 1924 у БДУ, з 1930 у Мінскім мед. ін-це. Адзін з арганізатараў БелНДІ крыміналістыкі, крыміналогіі і суд. экспертызы і Цэнтр. судова-мед. лабараторыі. З 1939 у 1-м Маскоўскім мед. ін-це. У 1945 у Надзвычайнай дзярж. камісіі па выяўленні і расследаванні злачынстваў ням.-фаш. захопнікаў і іх саўдзельнікаў і прычыненых імі страт на тэр. Беларусі. Навук. працы па суд. балістыцы, судова-мед. гельмінталогіі і дэанталогіі.

Тв.: Судебномедицинская деонтология. М., 1957; Судебная медицина. 3 изд. М., 1963 (разам з У.М.Смальянінавым, К.І.Таціевым).

ЧАРВА́КСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА. На р. Чырчык, ва Узбекістане. Утворана плацінай аднайм. ГЭС. Запоўнена ў 1970—75. Пл. 84 км², аб'ём 2 км³, даўж.

ГЭС на **Чарвакскім вадасховішчы**.

25 км. Сезоннае рэгуляванне сцёку. Выкарыстоўваецца для арашэння, рэкрэацыі.

ЧАРВАНЁЎ Юрый Мікалаевіч (н. 15.1.1958, г. Баранавічы Брэсцкай вобл.), бел. спартсмен (лёгкая атлетыка, бар'ерны бег). Майстар спорту СССР міжнар. класа (1979). Скончыў Бел. ін-т фіз. культуры (1979). З 1979 інструктар мінскага аблсавета т-ва «Дынама», у 1984—96 трэнер каманды Белпалка т-ва «Дынама». З 2001 старшыня судзейскай калегіі міжнар. к-та па «Пірамідзе» (больярдны спорт). Чэмпіён Еўропы ў закрытых памяшканнях (1980, г. Зіндэльфінген, Германія) і СССР (1980) у бегу на 60 м з бар'ерамі. Чэмпіён СССР (1981) у бегу на 110 м з бар'ерамі. Рэкардсмен Еўропы, свету (1977, 1980).

ЧАРВАНЮ́К Яўген Іванавіч (21.4.1924, г.п. Брусілаў Жытомірскай вобл., Украіна — 12.2.1982), украінскі спявак (бас), педагог. Нар. арт. СССР (1967). Скончыў Кіеўскую кансерваторыю (1950). У 1952—77 саліст Харкаўскага т-ра оперы і балета. Адначасова з 1960 выкладаў у Харкаўскім муз.-драм. ін-це (з 1974 праф.). Валодаў сакавітым, выразным голасам цёплага тэмбру. Першы выканаўца партый Арбеніна («Маскарад» А.Артамонава), Берніка («Букавінцы» М.Кармінскага) і інш. Сярод інш. партый: Тарас Бульба, Выбарны («Тарас Бульба», «Наталка Палтаўка» М.Лысенкі), Карась («Запарожац за Дунаем» С.Гулак-Арцямоўскага), Крыванос («Багдан Хмяльніцкі» К.Данькевіча), Сусанін («Іван Сусанін» М.Глінкі), Барыс Гадуноў («Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага), Філіп II («Дон Карлас» Дж.Вердзі) і інш.

ЧАРВІ́НКА, рака ў Сенненскім і Чашніцкім р-нах Віцебскай вобл., правы прыток р. Усвейка (бас. р. Зах. Дзвіна). Даўж. 23 км. Пл. вадазбору 98 км^2. Пачынаецца каля в. Старая Беліца Сенненскага р-на, вусце за 1,5 км на ПдЗ ад в. Баркі Чашніцкага р-на. Цячэ ў межах Аршанскага ўзв. Рэчышча ў верхнім і ніжнім цячэнні на працягу 14,3 км каналізаванае.

ЧАРВІ́НСКІ Павел Іванавіч (псеўд. Сава; 1841, г. Горкі Магілёўскай вобл., паводле інш. звестак Віцебская губ. — 19.3.1864), адзін з кіраўнікоў *паўстання 1863—64* на Беларусі і ў Літве. З дваран. У пач. 1860-х г. вучыўся ў Ін-це горных інжынераў і Тэхнал. ін-це ў Пецярбургу, быў звязаны з арг-цыяй «Зямля і воля». У пач. 1863 у маёнтку Марыенгаўзен Віцебскай губ., дзе была друкарня «Зямлі і волі», удзельнічаў у падрыхтоўцы паўстання. Вясной 1863 зняволены ў Дынабургскую крэпасць, 19.6.1863 пазбаўлены правоў і засуджаны на 4 гады катаргі. 1.7.1863 уцёк з-пад варты і далучыўся да атрада Э.Вжаснёўскага, які дзейнічаў у Вількамірскім і Панявежскім пав. Ковенскай губ. У кастр. 1863 узначаліў асобны паўстанцкі атрад у Вількамірскім пав. (Анікшты, Андронішкі, Віжуны, Ушполь), атрымаў некалькі перамог над урадавымі войскамі. За мужнасць К.Каліноўскі надаў Ч. званне паручніка і прызначыў яго паўстанцкім ваен. начальнікам Новааляксандраўскай акр. 3.1.1864 яго атрад разбіты, паранены Ч. трапіў у палон. Часовым палявым аўдытарыятам прыгавораны да смяротнага пакарання, павешаны ў мяст. Ушполь. Браты Ч.: Ян — кіраўнік паўстанцкага атрада — расстраляны ў Кіеве; Раймонд, які змагаўся ў атрадзе Звяждоўскага, загінуў на Магілёўшчыне.

Г.В.Кісялёў, Я.Я.Янушкевіч.

ЧАРВЯ́ГІ (Caeciliidae), сямейства атр. бязногіх земнаводных. 25 родаў, 165 відаў. Пашыраны ў тропіках Азіі, Афрыкі, Цэнтр. і Паўд. Амерыкі. Большасць жывуць у вільготнай глебе, некат. — у

Чарвяга кольчатая, якая паядае дажджавога чарвяка.

мурашніках, тэрмітніках, вадзе. Найб. вядомыя Ч. кольчатая (Siphonops annulatus), рыбазмеі (Ichtyopsis).

Даўж. да 120 см. Вонкавым выглядам нагадваюць вял. дажджавых чарвей (адсюль назва) ці змей. Цела з кальцавымі перахватамі (каля 400), чорнае з белаватымі баразёнкамі паміж кольцамі або аліўкава-карычневае. Большасць адкладваюць яйцы (да 30) і ахоўваюць іх, зрэдку і лічынак; водныя Ч. жывародныя. Кормяцца чарвямі і інш. беспазваночнымі. Іл. гл. таксама да арт. *Земнаводныя.*

ЧАРВЯКО́Ў Аляксандр Рыгоравіч (8.3.1892, в. Дукарка Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. — 16.6.1937), дзяржаўны і парт. дзеяч Беларусі і СССР. Скончыў Віленскі настаўніцкі ін-т (1915). У час 1-й сусв. вайны прызваны ў армію, вёў рэв. прапагандысцкую работу ў вайсковых гуртках і арг-цыях. З мая 1917 чл. РСДРП. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў *Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі* бальшавіцкага кірунку. Удзельнік Кастр. рэвалюцыі 1917 у Петраградзе. У лют.—маі 1918 камісар *Беларускага нацыянальнага камісарыята.* З ліп. 1918 у Чырв. Арміі: камісар дывізіі, нач. аддзела Усерас. бюро ваен. камісараў. Адначасова ўваходзіў у кіруючае ядро *Беларускіх секцый РКП(б).* У ліку 5 членаў *Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі* 1.1.1919 падпісаў у Смаленску Маніфест аб абвяшчэнні *Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі* (ССРБ). У 1919 камісар асветы ССРБ, нам. наркома асветы Літ.-Бел. ССР, нач. палітаддзела Гомельскага ўмацаванага раёна, асобнай Гомельскай крапасной брыгады. Пасля ўступлення польскіх легіёнаў на тэр. Беларусі ў палітаддзеле Зах. фронту. У 1920 нач. аддзела РВС Зах. фронту, старшыня *Мінскага губернскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта,* ВРК ССРБ. 31.7.1920 ад імя ЦК КП(б)Б падпісаў *Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь.* Удзельнік мірных перагавораў з Польшчай у Рызе (кастр. 1920). У 1920—24 старшыня ЦВК і СНК БССР, у 1924—37 старшыня ЦВК БССР. Удзельнічаў у падрыхтоўцы ўтварэння СССР, распрацоўцы 5-гадовых планаў развіцця нар. гаспадаркі і культуры СССР і БССР, Канстытуцый СССР і БССР. Вял. ўвагу аддаваў умацаванню і развіццю бел. сав. дзяржаўнасці, нац. культуры, асветы, ліквідацыі непісьменнасці. Аўтар прац па гісторыі барацьбы бел. народа за сав. ўладу, эканам. і культ. становішчы бел. рэспублікі. З пач. 1930-х г. Ч. падвяргаўся неабгрунтаваным абвінавачанням у адыходзе і скажэнні ген. лініі партыі. Скончыў самагубствам. Чл. ЦБ КП(б)Б У 1920—24, ЦК і Бюро ЦК КП(б)Б у 1924—37. Чл. ЦВК БССР у 1919—37 і яго Прэзідыума, ЦВК СССР і яго Прэзідыума з 1922. Чл. ЦВК Літ.-Бел. ССР у 1919.

Тв.: Сем гадоў улады рабочых і сялян. Мн., 1924; За Савецкую Беларусь. Мн., 1927; ...Я ніколі не быў ворагам: Выбр. арт. і прамовы. Успаміны сучаснікаў. Мн., 1992.

Літ.: Якутов В.Д. А.Г.Червяков. Мн., 1978. *Р.П.Платонаў.*

ЧАРВЯ́ТКА, Чарвята, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Палата, за 1,5 км на Пн ад в. Кулькі, за 24 км на ПнУ ад Полацка. Пл. 4,25 км^2, даўж. 2,55 км, найб. шыр. 2,35 км, найб. глыб. 2,6 м, даўж. берагавой лініі 7,8 км. Пл. вадазбору 13,7 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу, акруглай формы. Схілы катлавіны выш. 5—7 м, параслі лесам. Берагі нізкія, забалочаныя, пад лесам і хмызняком. Дно сапрапелістае. Шыр. паласы прыбярэжнай расліннасці да 80 м, зарастае да глыб. 0,7—1 м. Злучана пратокай з воз. Галовец, выцякае ручай у р. Палата.



Цыліндрычная **чарвячная перадача**: 1 — чарвячнае кола; 2 — чарвяк.

ЧАРВЯЦЫ́, насякомыя атр. раўнакрылых, гл. *Артазіды*.

ЧАРВЯ́ЧНАЯ ПЕРАДА́ЧА, механізм для перадачы вярчэння паміж скрыжаванымі валамі з дапамогай чарвяка (дэталь з вінтавой нарэзкай) на вядучым вале і чарвячнага кола на вядзёным. Вугал скрыжавання валоў звычайна 90°. Перадатачны лік да 300 і болей, ккдз адносна нізкі (0,5—0,85).

Бываюць цыліндрычныя і глабоідныя. Разьба чарвяка правая ці левая, колькасць заходаў чарвяка звычайна да 4, профіль разьбы — архімедаў, канвалютны і эвальвентны, а таксама ўвагнуты. Ч.п. вызначаюцца бясшумнасцю і плаўнасцю ў рабоце, кампактнасцю; недахоп — значнае адноснае слізганне спалучаных звёнаў. Выкарыстоўваюцца ў сілавых перадачах пад'ёмна-трансп. машын, станкоў, гідратэхн. збудаванняў і інш.

В.М.Кандрацьеў.

ЧАРГАВА́ННЕ ГУ́КАЎ, альтэрнацыя, заканамерная замена *гукаў мовы* ў межах адной і той жа марфемы ў розных словах або словаформах.

Адрозніваюць Ч.г. гіст. і пазіцыйнае (фанет.). Гіст. абумоўлена гукавымі працэсамі, якія адбываліся ў стараж. перыяд і ў сучасны бел. мове не існуюць: «б — бл» («любіць — люблю»), «п — пл» («сыпаць — сыплю»), «в — ўл» («славіць — слаўлю»), «ф — фл» («графіць — графлю») і інш. Пры пазіцыйным чаргаванні змена гукаў у слове абумоўлена фанет. законамі сучаснай мовы. Найб. частыя пазіцыйныя Ч.г. у бел. мове — «о, е — а» («дом — дамы», «сем — с'амі»), «у — ў» («ён узяў — яна ўзяла»), «і — ы» («ісці — адысці»), звонкія і глухія («сады — сат»), цвёрдыя і мяккія («рука — рук'і»), свісцячыя і шыпячыя («груз'іць' — грушчык») зычныя.

Літ.: Юргелевіч П.Я. Курс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі. Мн., 1974; Фанетыка беларускай літаратурнай мовы. Мн., 1989. *М.Р.Прыгодзіч.*

ЧАРГІНЕ́Ц Мікалай Іванавіч (н. 17.10.1937, Мінск), бел. пісьменнік, дзярж. дзеяч Беларусі. Ген.-лейтэнант унутр. службы (1993). Канд. юрыд. н. (1977). Праф. (2000). Засл. работнік МУС СССР (1977). Скончыў БДУ (1967). З 1964 у органах унутр. спраў, у 1981—84 нач. Упраўлення крымін. вышуку МУС Беларусі, з 1987 — Бел. ўпраўлення ўнутр. спраў па транспарце МУС Беларусі. З 1993 старшыня К-та па сац. абароне ваеннаслужачых, ветэранаў вайны і памяці загінуўшых пры Савеце Міністраў Беларусі, з 1997 — Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нац. сходу Рэспублікі Беларусь па міжнар. справах і нац.-бяспецы, з 1998 — Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па знешняй палітыцы. З 2002 старшыня Беллітфонду. Друкуецца з 1973. Піша на рус. мове. У дакумент. аповесцях «Чацвёрты след» (1973), «Следства працягваецца» (1977), аповесцях «Трывожная служба» (1975), «Фінал Краба» (1979), «Служба — дні і ночы» (1981), рамане «Вам — заданне» (1982) характары, побыт, складаная і небяспечная служба работнікаў міліцыі ў Вял. Айч. вайну і ў мірны час. Раманы «Тайна Чорных Гор» (1987), «Сыны» (1989) пра вайну ў Афганістане, аповесць «Загад №1» (1985) — гісторыка-паліт. дэтэктыў пра станаўленне сав. улады на Беларусі. Раман-прадбачанне «Ілоты вар'яцтва» (1995) пра барацьбу з міжнар. тэрарызмам. Дэтэктыўна-паліт. раман «Тайна Авальнага кабінета» (2001) пра традыц. ўклад амерыканцаў, жыццё ў Белым доме. Аўтар навук. прац у галіне правазнаўства, кінасцэнарыяў і спектакляў паводле ўласных раманаў.

Тв.: За секунду до выстрела: Роман-дилогия. М., 1992; Кремлевский колодец. Мн., 1998; Убить вождя. Мн., 1999; Черный пес. Мн., 2000; Смертельный квадрат. Мн., 2000; Смертник. Мн., 2002; Упреждающий удар. Мн., 2002; Побег. Мн., 2002; Последний герой. Мн., 2003. *Л.С.Савік.*

А.Р.**Чарвякоў**.

М.І.**Чаргінец**.

ЧАРДАРЫ́НСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА. На р. Сырдар'я, у Казахстане і Узбекістане. Утворана плацінай аднайм. гідравузла ў 1967—68. Пл. 900 км^2, аб'ём 5,7 км^3, даўж. 70 км, найб. шыр. 20 км. Сезоннае рэгуляванне сцёку. Ваганні ўзроўню да 8 м. Выкарыстоўваецца для арашэння і прадухілення навадненняў. Рыбалоўства.

ЧА́РДАШ (венг. csárdás ад csárda шынок, карчма), венгерскі нар. і бальны танец. Муз. памер 2/4 ці 4/4. Ч. характэрны сінкапіраваная рытміка, віртуозная імправізацыя. Складаецца з 2 кантрастных частак: павольнай (патэтычнай), якая суправаджае мужчынскі колавы танец, і хуткай, імклівай, якая суправаджае запальны парны. Вядомы з сярэдзіны 19 ст. Стаў асновай бальнага танца «венгерка», які пашырыўся ў пач. 20 ст. Выкарыстаны ў творах І.Брамса, Л.Дэліба, І.Кальмана, Ф.Ліста, П.Чайкоўскага і інш.

ЧАРДЖО́Ў, назва г. *Туркменабат* ў Туркменістане ў 1940—1999.

ЧАРДЫ́НЦАЎ Валерый Аркадзевіч (н. 21.8.1936, г. Свярдлоўск, Расія), бел. вучоны ў галіне радыётэхнікі. Д-р тэхн. н. (1984), праф. (1986). Акад. Бел. інж. акадэміі і яе прэзідэнт (1993), акад. Міжнар. інж. акадэміі (2000). Засл. дз. нав. Беларусі (2001). Скончыў Уральскі політэхн. ін-т (Свярдлоўск, 1959). З 1968 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі (у 1972—75 і з 1988 заг. кафедры). Навук. працы па тэорыі і тэхніцы прыёму і апрацоўкі стахастычных сігналаў у каналах з інтэнсіўнымі перашкодамі. Распрацаваў тэорыю нелінейнай фільтрацыі дыскрэтна-неперарыўных маркаўскіх працэсаў у дастасаванні да сістэм радыёлакацыі, радыёнавігацыі і перадачы інфармацыі.

Тв.: Статистическая теория совмещенных радиотехнических систем. Мн., 1980; Радиотехнические системы. Мн., 1988; Прием сигналов на фоне помех. Мн., 1998 (разам з В.М.Козелам, М.У.Дарашэвічам). *А.І.Болсун.*

ЧАРКАЗЯ́Н Ганад Бадрыевіч (н. 18.10.1946, в. Ерасхаўн, Арменія), бел. пісьменнік. Скончыў БПІ (1984). Працаваў у Бел. дарожным НДІ, рамонтна-буд. управленнях, на фабрыцы. З 1993 у выд-ве «Мастацкая літаратура». Друкуецца з 1963. Піша на курдскай, арм. і рус. мовах. У зб-ках паэзіі «Трываласць» (1980), «Колер дабрыні» (1986), «Прастора і час» (1990), «Абпаленыя жаўрукі» (1992; усе ў перакладзе на рус. мову), «Плач» (1994; у перакладзе на рус. і бел. мовы), кн. прозы і паэзіі «Дом дажджу» (2001), «Туга па доме» (2003; абедзве ў перакладзе на рус. мову) і інш. роздум над лёсам курдскага і бел. народаў, тэма сяброўства, кахання, дабра і зла, жыцця і смерці. Піша казкі для дзяцей («Казкі дзеда Ганада», 1996).

Тв.: Бел. пер. — Караваны гор. Мн., 1996; Шамдзін: Навелы, лірыка. Мн., 1998; Чаргаві. Мн., 2001; Рус. пер. — Камни печали: Новеллы. Мн., 1999.

Літ.: Карлюкевіч А.М. Кім сябе ўяўляе чалавек?: (Чытаючы прозу Ганада Чарказяна). Мн., 1999.

ЧАРКА́САВА, комплекс археал. помнікаў (гарадзішча, селішча і курганны могільнік) каля в. Чаркасава Аршанскага р-на Віцебскай вобл. Гарадзішча адносіцца да ранняга жал. веку і часоў Кіеўскай Русі. Пры даследаванні яго валоў выяўлены рэшткі драўляных канструкцый 6—8 ст., знойдзены ляпная кераміка (штрыхаваная з расчосамі і гладкая), вырабы з жалеза (серпападобны нож, каса-гарбуша, шпоры, наканечнік кап'я, шпількі з кольцам), касцяныя праколкі, амулеты, вырабы з бронзы, фрагменты шкляных бранзалетаў, амфарка кіеўскага тыпу, свінцовая пячатка і інш. На паверхні селішча ранняга сярэдневякоўя знойдзены фрагменты керамікі стараж.-рус. часу. Курганны могільнік 11—12 ст. належаў *крывічам*. Знойдзены бронзавыя скроневыя паясныя кольцы, ліпападобныя пражкі, літыя і пласціністыя пярсцёнкі, бляшкападобныя падвескі, бразготкі, золаташкляныя і сардалікавыя пацеркі, ганчарныя гаршкі з клеймамі. Пахавальны абрад — трупапалажэнне.

ЧАРКА́САВА Лідзія Сямёнаўна (20.11.1909, г.п. Мікалаеўка Днепрапятроўскай вобл., Украіна — 3.8.1999), бел. вучоны ў галіне біяхіміі. Д-р біял. н. (1955), праф.

(1957). Засл. дз. нав. (1975). Скончыла Адэскі медыка-аналіт. ін-т (1931). Працавала ў Пермскім і Казанскім стаматалагічных ін-тах. У 1950—81 у Ін-це фізіялогіі АН Беларусі (заг. лабараторыі), адначасова ў БДУ (1957—72). Навук. працы па вывучэнні ўздзеяння розных відаў іанізавальнай радыяцыі на абмен бялкоў і вугляродаў у ц.н.с., зрухаў у нейраэндакрыннай сістэме пад уздзеяннем малых доз іанізавальных выпрамяненняў. Дэлегат 15-й сесіі Ген. асамблеі ААН ад Беларусі (1960, Нью-Йорк).

Тв.: Выкарыстанне радыеактыўных ізатопаў у біялогіі і медыцыне. Мн., 1957; Основы клинической биохимии. М., 1965 (разам з М.Ф.Мержынскім); Метаболические сдвиги в митохондриях облученного организма, связанные с циклом трикарбоновых кислот. Мн., 1977 (разам з А.Ц.Пікулевым, М.Ю.Тайцам). *М.К.Туміловіч.*

ЧАРКА́САЎ Аляксей Цімафеевіч (2.6.1915, в. Патапава Краснаярскага краю, Расія — 13.4.1973), рускі пісьменнік. Вучыўся ў Краснаярскім аграпед. ін-це. Працаваў аграномам. Дылогія «Сказанне пра людзей тайгі» (раманы «Хмель», 1951—66; «Чорная таполя», 1969) пра падзеі, што адбываліся пераважна ў Сібіры ад паўстання дзекабрыстаў да рэв. 1917. Аўтар рамана «Дзень пачынаецца на Усходзе» (1949), зб-каў аповесцей і апавяд. «Ліка» (1959), «Шумейка» (1962), аповесці «Ластаўка» (1965) і інш.

ЧАРКА́САЎ Анатоль Паўлавіч (28.11.1928, г. Светлаводск Кіраваградскай вобл., Украіна — 4.11.2000), бел. пісьменнік, перакладчык. Скончыў БДУ (1956). Працаваў у Дзярж. выд-ве Беларусі (1956—64), у выд-вах «Беларусь» (з 1967), «Мастацкая літаратура» (з 1972), «Юнацтва» (1986—89). Друкаваўся з 1953. Аўтар зб-каў навук.-папулярных нарысаў для дзяцей «Балотны скарб» (1959), «Цудоўны камень» (1963), нарысаў пра Мінскі трактарны («Магутны твой зямляк», 1969) і Бел. аўтамаб. («Волаты на дарогах», 1974) заводы. Пераклаў на бел. мову «Аповесць пра суровага сябра» Л.Жарыкава (1961), «Клуб калумбаў» В.Біянкі (1962), «Тры дні спакою» М.Прыляжаевай (1970), зб. аповесцей і апавяданняў І.Васіленкі «Зялёны куфэрак» (1964) і інш. Паводле яго сцэнарыяў паст. дакумент. і навук.-папулярныя фільмы.

Тв.: Паштальён: Апавяданне ў малюнках. Мн., 1991; На ўсе рукі майстар: Нарыс. Мн., 1993.

ЧАРКА́САЎ Мікалай Канстанцінавіч (27.7.1903, С.-Пецярбург — 14.9.1966), расійскі акцёр. Нар. арт. СССР (1947). Скончыў Ленінградскі ін-т сцэн. мастацтваў (1926). На сцэне з 1919, выступаў як мім і характарны танцоўшчык. З 1926 акцёр Ленінградскага т-ра юнага гледача, выступаў у мюзік-холах, з 1931 у ленінградскіх перасоўным т-ры «Камедыя», у 1934—64 у т-ры драмы імя А.Пушкіна. Яго мастацтва вызначалася псіхал. дакладнасцю характарыстык, драматызмам у спалучэнні з завостранасцю і графічнасцю знешняга малюнка ролі, віртуозным пераўвасабленнем, імправізацыяй, схільнасцю да гратэску. Сярод роляў: Сільвестр («Хітрыкі Скапэна» Мальера), Звяздзінцаў («Плады асветы» Л.Талстога), Варлаам («Барыс Гадуноў» Пушкіна), Іван Грозны («Вялікі гасудар» У.Салаўёва), Хлудаў («Бег» М.Булгакава), Дон Кіхот («Дон Кіхот» А.Брушцэйн і Б.Зона, «Дон Кіхот» Булгакава; абодва паводле М.Сервантэса), Пётр I («Пётр I» А.Талстога), Крагстад («Лялечны дом» Г.Ібсена), Мічурын («Жыццё ў квецені» А.Даўжэнкі), Дронаў («Усё застаецца людзям» С.Алёшына) і інш. З 1927 здымаўся ў кіно: «Дзеці капітана Гранта» (1936), «Дэпутат Балтыкі» (1937), «Пётр Першы» (1937,

М.Чаркасаў у ролі Івана Грознага.

1939), «Аляксандр Неўскі» (1938), «Іван Грозны» (1945), «Аляксандр Папоў», «Шчаслівага плавання» (абодва 1949), «Мусаргскі» (1950), «Дон Кіхот» (1957), «Усё застаецца людзям» (1963), «Трэцяя маладосць» (1966) і інш. Зняўся ў бел. фільмах «Яго яснавяльможнасць» (1928), «Новы дом» (1947) і інш. Аўтар кніг «З запісак акцёра» (1951), «Запіскі савецкага акцёра» (1953) і інш. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1946, 1950, 1951 (двойчы). Ленінская прэмія 1964.

Тв.: В театре и в кино. 2 изд. М., 1973.

Літ.: Зубков Ю.А. Творчество Н.К.Черкасова. М., 1964; Герасимов Ю.К., Скверчинская Ж.Г. Черкасов. 2 изд. М., 1977; Черкасова Н. Рядом с Черкасовым. Л., 1978. *Л.В.Календа.*

ЧАРКА́СКАЯ ВО́БЛАСЦЬ. Размешчана ў цэнтр. ч. Украіны. Утворана 7.1.1954. Пл. 20,9 тыс. км^2. Нас. 1431 тыс. чал. (2001), гарадскога 52%. Цэнтр — г. *Чаркасы*. Найб. гарады: Умань, Смела, Канеў, Корсунь-Шаўчэнкаўскі.

Паверхня пераважна раўнінная. Большая ч. вобласці на правабярэжжы р. Дняпро ў межах Прыдняпроўскага ўзв. (выш. да 266 м), левабярэжная частка — у межах Прыдняпроўскай нізіны (выш. 90—170 м). Карысныя выкапні: буры вугаль, торф, гаручыя сланцы, бентанітавыя гліны, граніты, гнейсы, пяскі; крыніцы мінер. вод. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. -5,9 °С, ліп. 19,5 °С. Ападкаў 450—520 мм за год. Гал. рака Дняпро з прытокамі Рось, Альшанка, Цясмін, Супой; Горны і Гнілы Цікач (бас. р. Паўд. Буг). У межах вобласці часткі Крамянчугскага і Канеўскага вадасховішчаў. Шмат азёр. Глебы — пераважна ападзоленыя і сярэднягумусныя чарназёмы, на ўзвышаных участках — шэрыя ападзоленыя, на Левабярэжжы — тыповыя чарназёмы. Пад лесам (хвоя, дуб, граб, клён, бяроза, ліпа) і лесапалосамі каля 7% тэр. Канеўскі запаведнік.

Гал. галіны прам-сці: харч. (цукр., мясная, малочная і масласыраробная, алейная, кансервавая, рыбная), камбікормавая, машынабудаванне і металапрацоўка (абсталяванне для харч., тэкст., хім. прам-сці, гандлю, жывёлагадоўлі, вежавыя краны, трактарныя прычэпы, металарэзныя станкі, радыёпрылады, медтэхніка), лёгкая (швейная, тэкст., трыкат., галантарэйная), хім. (штучнае валакно, мінер. ўгнаенні, рэактывы, пластмасы), дрэваапр., у т.л. мэблевая. Вытв-сць буд. матэрыялаў. Здабыча бурага вугалю, торфу. Вытв-сць электраэнергіі на Крамянчугскай і Канеўскай ГЭС, Чаркаскай ЦЭЦ. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на вырошчванні збожжавых культур, цукр. буракоў і мяса-малочнай жывёлагадоўлі. Пад с.-г. ўгоддзямі 1460 тыс. га, пасяўная пл. 1232 тыс. га (2000). Пасевы збожжавых (пшаніца, кукуруза, жыта, зернебабовыя), тэхн. (цукр. буракі, сланечнік) і кармавых культур. Бульбаводства, агародніцтва. Садоўніцтва (яблыкі, грушы, абрыкосы, слівы, вішні, чарэшні). Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней, авечак, птушак. Трусагадоўля. Пчалярства. Рыбаводства. Даўж. чыгунак 651 км, аўтадарог з цвёрдым пакрыццём каля 6 тыс. км. Гал. чыгункі Кіеў—Днепрапятроўск, Масква—Адэса, Данецк—Львоў; аўтадарогі Кіеў—Умань—Адэса, Кіеў—Днепрапятроўск, Чаркасы—Мікалаеў. Суднаходства па Дняпры. Газаправод

Урэнгой—Памары—Ужгарад і інш. Курорт Сасноўка.

ЧАРКА́СЫ, горад, цэнтр Чаркаскай вобл. Украіны. Вядомы з 1394, горад з 1795. 307 тыс. ж. (2001). Чыг. станцыя. Порт на Крамянчугскім вадасховішчы. Прам-сць: хім. (мінер. ўгнаенні, іонаабменныя смолы, валокны, пластмасы, рэактывы), харч. (кансервавая, цукр., малочная, мясная, тытунёвая), лёгкая (шаўковая, трыкат., швейная), машынабудаванне і металаапрацоўка (спец. тэхнал. абсталяванне і інш.), мэблевая; вытв-сць буд. матэрыялаў. ЦЭЦ. Пед. ін-т. Тэатры: муз.-драм., лялек. Філармонія. Краязнаўчы музей. Планетарый.

Чаркасы. Палац культуры.

ЧАРКА́СЫ, радовішча жвірова-пясчанага матэрыялу ў Дзяржынскім р-не Мінскай вобл., паміж вёскамі Слабодка, Васілеўшчына, Чаркасы і Лабады. Пластападобны паклад звязаны з марэннымі адкладамі сожскага гарызонту. Жвірова-пясчаны матэрыял жаўтаваташэры, з гнёздамі бурага, ажалезненага, участкамі гліністы, з праслоямі пяску; кандыцыйнага жвіру 20,5—59,8%. Пясок у сумесі палевашпатава-кварцавы, розназярністы, слаба гліністы. Разведаныя запасы 14 млн. м^3. Магутнасць карыснай тоўшчы 3,3—12,9 м, ускрышы (пяскі, супескі) 0,2—10,5 м. Жвірова-пясчаны матэрыял прыдатны для дарожнага буд-ва і вытв-сці бетону.

А.П.Шчураў.

ЧА́РЛСТАН, чарлстон (англ. charleston), амерыканскі быт. і бальны танец. Муз. памер 4/4. Рытм сінкапіраваны. Узнік у 1922 у г. Чарлстан (ЗША; адсюль назва). Паходзіць ад *рэгтайма*. Пашыраны ў многіх краінах свету да канца 1930-х г. і ў 1960—70-я г.

ЧА́РЛТАН (Charlton) Роберт (Бобі; н. 11.10.1937, г. Ашынгтан, Вялікабрытанія), англ. спартсмен (футбол). Выступаў за англ. клубы «Манчэстэр Юнайтэд» (1954—73) і «Прэстан Норт Энд» (1973—75), ірландскі клуб «Уотэрфорд» (1976). У зборнай камандзе Вялікабрытаніі (1957—73) згуляў 106 матчаў, забіў 49 мячоў. Чэмпіён свету (1966), бронз. прызёр чэмпіянату Еўропы (1968), чэмпіён Англіі (1957, 1965, 1967). Уладальнік Кубка свету (1966), Кубка еўрап. чэмпіёнаў (1968), Кубка Англіі (1963). Уладальнік прыза «Залаты мяч» (1966). З 1984 тэхн. дырэктар, пазней віцэ-прэзідэнт клуба «Манчэстэр Юнайтэд».

А.М.Петрыкаў.

ЧАРМІ́СЦА, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Палата, за 3 км на Пн ад в. Дрэтунь, сярод забалочанага лесу, за 36 км на ПнУ ад Полацка. Пл. 0,22 км^2, даўж. 1,2 км, найб. шыр. 180 м, даўж. берагавой лініі 2,5 км. Пл. вадазбору 25,2 км^2. Катлавіна выцягнута з Пн на Пд, яе схілы невыразныя, берагі забалочаныя. Вышкае ручай у воз. Дрэтунь.

ЧАРНАБА́ЕЎ Віктар Максімавіч (н. 16.5.1930, г. Новарасійск, Расія), бел. спявак (бас). Нар. арт. Беларусі (1964). З 1950 у Ансамблі песні і танца Маскоўскай ваен. акругі. З 1958 саліст Нац. акад. т-ра оперы Беларусі. Валодае моцным голасам мяккага тэмбру. Стварыў разнапланавыя вострахарактарныя вобразы. У операх бел. кампазітараў выканаў партыі: Даніла («Алеся» Я.Цікоцкага), Гаддеўскі («Яснае світанне» А.Туранкова), Тарас («Калючая ружа» Ю.Семянякі), Пісьмавадзіцель, Паліцэйскі («Джардана Бруна», «Візіт дамы» С.Картэса), Начальнік штаба («Сцежкаю жыцця» Г.Вагнера). Найб. значныя партыі: Мефістофель («Фауст» Ш.Гуно), Млынар («Русалка» А.Даргамыжскага), цар Дадон («Залаты пеўнік» М.Рымскага-Корсакава), Дон Базіліо, Дон Бартала («Севільскі цырульнік» Дж.Расіні), Дон Паскуале («Дон Паскуале» Г.Даніцэці), Уберта («Служанка-пані» Дж.Б.Пергалезі), Галіцкі («Князь Ігар» А.Барадзіна), Лепарэла («Дон Жуан» В.А.Моцарта). Сярод інш. работ: Мендоза, Кутузаў («Заручыны ў манастыры», «Вайна і мір» С.Пракоф'ева), Сусанін («Іван Сусанін» М.Глінкі), Філіп II, Рамфіс («Дон Карлас», «Аіда» Дж.Вердзі), Агамемнан («Арэстэя» С.Танеева), Фрол Баеў («У буру» Ц.Хрэннікава), Гарэлаў («Брэсцкая крэпасць» К.Малчанава), Хаванскі, Варлаам («Хаваншчына», «Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага). Зняўся ў тэлеоперы «Ранак» Вагнера, тэлеварыянце оперы «У пушчах Палесся» А.Багатырова.

Літ.: Жураўлёў Дз.М. Віктар Чарнабаеў // Майстры беларускай сцэны. Мн., 1978. Кн. 3; Первякова Н.А. А шлях — ён у кожнага свой // Тэатр. Мінск. 1980. №3.

І.В.Глушакоў.

В.М.**Чарнабаеў.**

ЧАРНАБО́Г, Чорны бог, персанаж язычніцкай міфалогіі славян, увасабленне чорных (нядобрых, злых) сіл; бог бяды і няшчасця. Супрацьлегласць Ч. — *Белабог.*

ЧАРНАВІ́ЦКАЯ ВО́БЛАСЦЬ. Размешчана на З Украіны. Мяжуе на Пд з Румыніяй, на ПдУ з Малдовай. Утворана 7.8.1940. Пл. 8,1 тыс. км^2. Нас. 932 тыс. чал. (2001), гарадскога 42%. Цэнтр — г. *Чарнаўцы*. Найб. гарады: Старажынец, Хацін, Сакіраны.

Паверхня паўн. ч. вобласці раўнінная (міжрэчча Днястра і Прута), выш. да 515 м. У цэнтр. частцы перадгор'і Карпат, на ПдЗ — Усх. Карпаты (выш. да 1565 м, г. Яровіца). Карысныя выкапні: вапнякі, гліны, гіпс, фасфарыты, кварцавыя і глаўканітавыя пяскі, буры вугаль, крыніцы мінер. вод. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз.

В.**Чарнабаеў** (злева) у ролі Дона Паскуале.

ад -5 °С на раўніне да -6 °С у гарах, ліп. адпаведна 20 °С і 15 °С. Ападкаў 500—1200 мм за год. Гал. рэкі: Днестр, Прут з Чарамошам, Сірэт. Глебы на раўніне чарназёмныя, у перадгор'ях — дзярнова-падзолістыя, у гарах — бурыя лясныя. Пад лесам (бук, елка, граб, явар) і хмызнякамі каля 30% тэр., пашыраны ў перадгорнай і горнай частках.

Гал. галіны прам-сці: харч. (цукр., мясная, масласыраробная, вінаробная, плодаагароднінакансервавая, алейная і інш.), камбікормавая, лёгкая (тэкст., трыкат., швейная), машынабудаванне і металаапрацоўка (нафтаапаратура, выліч. тэхніка, машыны для жывёлагадоўлі, абсталяванне для лёгкай прам-сці), лясная і дрэваапр. (піламатэрыялы, драўнянастружкавыя пліты, мэбля), хім. (фарбы, лакі, гумавы абутак, быт. хімія). Выт-сць буд. матэрыялаў. Маст. промыслы (разьба па дрэве, апрацоўка металу, вышыўка, выт-сць дываноў).

Сельская гаспадарка спецыялізуецца на вырошчванні збожжавых і тэхн. культур, садоўніцтве і малочна-мясной жывёлагадоўлі. Пад с.-г. ўгоддзямі 470 тыс. га, у т.л. каля 100 тыс. га меліяравана. Пасяўная пл. ў 2000 склала 314 тыс. га. Вырошчваюць пшаніцу, кукурузу, зернебабовыя, цукр. буракі, лён-даўгунец, кармавыя караняплоды, травы, бульбу, агародніну. Садоўніцтва (яблыкі, грушы, чарэшні, грэцкія арэхі). Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней, авечак (у горных раёнах). Птушкагадоўля. Сажалкавае рыбаводства. Пчалярства. Даўж. чыгунак 464 км, аўтадарог з цвёрдым пакрыццём каля 3 тыс. км. Асн. чыгункі Львоў—Івана-Франкоўск—Чарнаўцы—Сірэт (Румынія), Чарнаўцы—Кішынёў—Адэса, аўтадарогі Брэст—Луцк—Цярнопаль—Чарнаўцы, Чарнаўцы—Адэса. Турызм.

ЧАРНАВУ́САЎ Уладзімір Іванавіч (н. 16.6.1956, Мінск), бел. матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1992). Скончыў БДУ (1978). З 1978 у Ін-це матэматыкі Нац. АН Беларусі. З 1998 працуе за мяжой (ФРГ, Канада). Навук. працы па тэорыі лінейных алг. груп, катамалогіях Галуа. Даказаў гіпотэзу Сера і прынцып Хасе для груп тыпу E_8 над лікавымі палямі. Пацвердзіў гіпотэзу Платонава—Маргуліса аб праектыўнай прастаце груп рацыянальных пунктаў для большасці груп выключных тыпаў. Апісаў групы R-эквівалентнасцей адназвязных груп класічных тыпаў.

Тв.: О проективной простоте некоторых групп рациональных точек над полями алгебраических чисел // Изв. АН СССР. Сер. мат. 1989. Т. 53, №2; The rationality problem for semisimple group varieties (разам з У.П.Платонавым) // Journal für die Reine und Angewandte Mathematik. 1998. Vol. 504.

ЧАРНАГО́РА, Чорныя горы, найбольш высокі горны масіў у паўд.-ўсх. ч. Украінскіх Карпат, у Закарпацкай і Івана-Франкоўскай вобл. Украіны. Выш. да 2061 м (г. Гаверла). Складзены з гліністы сланцаў, пясчанікаў, мергеляў. На схілах букавыя і яловыя лясы, альпійскія лугі, якія выкарыстоўваюцца як пашы. *Карпацкі запаведнік.*

ЧАРНАГО́РЫЯ (Црна Гора), Рэспубліка Чарнагорыя (Рэспубліка Црна Гора), рэспубліка ў складзе *Сербіі і Чарнагорыі* (гл. Дадатак). Пл. 13,8 тыс. км^2. Насельніцтва 680,2 тыс. чал. (2000), пераважна чарнагорцы (70%), сербы, баснійцы, албанцы. Сталіца — г. Падгорыца. Размешчана на Пд Дынарскага нагор'я (выш. да 2522 м, г. Бобатаў-Кук). Раўнінныя ўчасткі на ўзбярэжжы Адрыятычнага м. і ўздоўж паўн. ўзбярэжжа воз. Шкодэр (Скадарскае). Карысныя выкапні: баксіты, свінцова-цынкавыя руды, буры вугаль і інш. Клімат умерана кантынентальны, на ўзбярэжжы — міжземнаморскі. Ападкаў 1600—1800 мм за год, каля ўзбярэжжа да 3000 мм. Найб. рэкі Тара і Морача. Схілы гор укрыты хваёвымі і мяшанымі лясамі, на ўзбярэжжы — міжземнаморская хмызняковая расліннасць. Нац. паркі: Біёградска-Гора, Дурмітар, Лоўчан. Гал. галіны прам-сці: горназдабыўная, электраэнергет., металург., дрэваапр., машынабудаванне. Здабыча баксітаў (каля г. Нікшыч), свінцова-цынкавых руд (раёны гарадоў Плеўля і Іванград), бурага вугалю, солі. Каскад ГЭС на р. Зета, ЦЭС у Плеўлі. Чорная металургія (Нікшыч), выплаўка алюмінію (Падгорыца); дрэваапр., цэлюлозна-папяровая, мэблевая (Мойкавац, Іванград, Падгорыца), эл.-тэхн. (Цэтыне) прам-сць і суднарамонт (Котар). Ёсць тэкст., харч., у т.л. рыбаконсервавыя, тытунёвыя прадпрыемствы. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на горна-пашавай жывёлагадоўлі, вырошчванні збожжавых культур і садоўніцтве. Гадуюць авечак, буйн. раг. жывёлу, птушак. Пасевы збожжавых (кукуруза, пшаніца, ячмень) і тэхн. (тытунь) культур, бульбы, агародніны, пераважна на прыазёрнай раўніне. Садоўніцтва (цытрусавыя, інжыр, гранат, міндаль, слівы). Насаджэнні алівы і вінаграднікаў. Рыбалоўства. Транспарт марскі, чыг. і аўтамабільны. Марскія парты: Бар і Котар. Міжнар. аэрапорт у Падгорыцы. Узбярэжжа — курортная зона. Турызм. Прыродны і культ.-гіст. рэгіён Котар і нац. парк Дурмітар уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны.*

Гісторыя. У старажытнасці тэр. Ч. насялялі *ілірыйцы.* У 1 ст. да н.э. яны завяваны Стараж. Рымам, з 1 ст. н.э. тэр. Ч. у складзе рым. прав. Далмацыя, з 297 — прав. Прэвалітана. З 493 частка тэр. Ч. ў складзе дзяржавы *остготаў*, з 536 — *Візантыі.* У 7 ст. тут рассяліліся славяне (сербскае племя дуклянаў), якія ў 9 ст. ўтварылі княства Дукля і прынялі хрысціянства ўсх. абраду. У часы праўлення кн. Уладзіміра [каля 970—1016] тэр. Ч. трапіла пад уладу Балгарыі, з 1018 — зноў Візантыі, панаванне якой скінуў кн. Васлаў [1031—51]. З 1077 Дукля (з 11—12 ст. наз. таксама Зета) — каралеўства. Кароль Бодзін [каля 1082 — каля 1101] стварыў Зецкую дзяржаву, куды ўключыў усе сербскія землі. З канца 12 ст. да 1366 Зета ў складзе сербскай дзяржавы *Няманічаў.* У 1361—1421 у Ч. правілі кн. Балшычы, пры якіх Зета вызвалілася з-пад улады Няманічаў (1366), потым да 1528 дынастыя Чарнаевічаў. Пад нацыскам туркаў (з канца 14 ст.) б.ч. насельніцтва Зеты перасялілася ў маладаступныя Чорныя горы, т.зв. Верхнюю Зету, якая з сярэдзіны 15 ст. пачала наз. Чарнагорыяй (пазней назва перайшла на ўсю краіну). У 1396—1443 прыморскімі гарадамі Ч. авалодала Венецыя. У 1470-я г. туркі заваявалі раўнінную ч. Ч., у 1496 падпарадкавалі і Верхнюю Зету. У 1499 Ч. афіцыйна ўключана ў Асманскую імперыю як асобны санджак (адм. адзінка) на чале з Чарнасвічам Скендэр-бегам, які прыняў ісламу. Мусульманства прыпялі і многія інш. чарнагорскія феадалы, т.зв. патурчэнцы. У 15—18 ст. Ч. фактычна ўяўляла сабой родаплемяннае грамадства са слаба развітымі феад. адносінамі. Плямёны падзяляліся на брацтвы, брацтвы на вял. сем'і — *задругі*, якім належала значная ч. зямлі. Улада знаходзілася ў руках плем. старшын — кнезаў і ваяводаў. У гэтых умовах гал. і амаль адзінай аб'ядноўчай сілай была правасл. царква. Пад яе кіраўніцтвам у 17 ст. ў Ч. склалася феад.-тэакратычная дзяржава на чале з мітрапалітам-уладыкам (з 1700 дынастыя *Негашаў*). З краіны былі выгнаны патурчэнцы. Чарнагорцы ваявалі супраць туркаў на баку Венецыі (1645—69) і *«Свяшчэннай лігі»* (1683—98), удзельнічалі ў рус.-тур. войнах 18—19 ст. на баку Расіі, з якой устанавілі цесныя сувязі (1711). У выніку венецыяна-тур. войны 1714—18 да Венецыі адышлі прыморскія землі Ч. Перамога чарнагорцаў над туркамі ў бітве пры сяле Крусы (1796) паклала пачатак фактычнай незалежнасці Ч., якая перастала плаціць падаткі Асманскай імперыі. У канцы 18 — 1-й пал. 19 ст. ў Ч. адбывалася цэнтралізацыя ўлады, уведзены нормы бурж. права, умацавалася яе міжнар. становішча. У час *напалеонаўскіх войнаў* яна выступала на баку Расіі. З 1852 Ч. — спадчыннае свецкае княства на чале з дынастыяй Негашаў.

У выніку *сербска-чарнагорска-турэцкіх войнаў 1876—78* і рус.-тур. вайны 1877—78 Ч. стала юрыдычна незалежнай дзяржавай (рашэнні *Берлінскага кангрэса 1878*), пашырыла свае межы і зноў атрымала выхад да мора. З 1910 Ч. — каралеўства. Удзел у *Балканскіх войнах 1912—13* дазволіў Ч. значна пашырыць тэр. У 1-й сусв. вайне Ч. ўдзельнічала на баку *Антанты*, у 1916—18 яна акупіравана аўстра-венг. войскамі. Пасля вызвалення ў ліст. 1918 дынастыя Негашаў адхілена ад улады, 1.12.1918 Ч. ўвайшла ў склад Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў (з 1929 *Югаславія*) і часова перастала існаваць як дзярж. ўтварэнне. У 1941 яе тэр. акупіравана італьян. войскамі, вызвалена нар.-вызв. арміяй Югаславіі ў канцы 1944. З 1945 Ч. Нар., з 1963 Сацыяліст. рэспубліка ў складзе Югаслаўскай Федэрацыі. Пасля яе распаду (1991) яна разам з Сербіяй 27.4.1992 утварыла новую Саюзную Рэспубліку Югаславію.

Да арт. **Чарнагорыя**. Від г. Котар.

На Ч. разам з Сербіяй былі накладзены міжнар. паліт. і эканам. санкцыі, хоць яна і не ўдзельнічала ў ваен. канфліктах на тэр. Босніі і Харватыі. Гэта паспрыяла нарастанню ў Ч. тэндэнцыі да размежавання з Сербіяй. Прэзідэнт М. Джуканавіч (са студз. 1998) паслядоўна выступае за фактычную незалежнасць краіны. У вер. 2000 большасць чарнагорцаў байкатавала выбары ў Саюзную Скупшчыну Югаславіі. 14.3.2002 падпісаны чарнагорска-сербскі дагавор аб перабудове ўзаемаадносін паміж Сербіяй і Ч. 4.2.2003 парламент Югаславіі прыняў Канстытуцыйную хартыю аб стварэнні новай дзяржавы — супольніцтва Сербіі і Чарнагорыі (СіЧ) як цалкам раўнапраўных дзяржаў.

. З паліт. партый Ч. найб. уплывовыя Дэмакр. партыя сацыялістаў Ч. (лідэр Джуканавіч), Нар. партыя Ч. Прафсаюзы ўваходзяць пераважна ў Канфедэрацыю аўт. прафсаюзаў СіЧ і Федэрацыю незалежных прафсаюзаў СіЧ.

Архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. На тэр. Ч. выяўлены неалітычная кераміка, паселішчы ілірыйцаў, рэшткі стараж.-грэч. і рым. гарадоў. У перыяд візант. панавання (6 ст.) традыцыі ант. культуры захоўваліся ў спрошчаным выглядзе. У сярэдневякоўі на мастацтва Ч. ўплывалі культуры Італіі і Далмацыі, Сербіі і Візантыі. У 9—10 ст. узводзілі 1-нефавыя і 3-конхавыя цэрквы; у 12—13 ст. — 3-нефавыя раманскія базілікі з плоскай драўлянай столлю, 1-нефавыя з паўцыркульным скляпеннем, а таксама пад уплывам сербскай арх. школы Рашкі (царква манастыра Морача, 1252). Рысы ант. традыцый праяўляліся ў разьбе па каменю (гал. чынам па мармуры). У 14—16 ст. у пабудовах прыморскіх раёнаў гатычныя дэталі спалучаліся з раманскімі формамі. У манум. жывапісе 11—12 ст. адчувальны ўплыў *каралінгскага адраджэння*. Мініяцюры 13—14 ст. адметныя спалучэннем элементаў раманскага і гатычнага стыляў з рысамі візант. іканаграфіі. Фрэскі царквы ў манастыры Морача блізкія да сербскага сценапісу. Адраджэнне і барока выявіліся ў дэталях асобных пабудоў, што захоўвалі раманскія і візант. традыцыі (царква манастыра Савіна каля г. Херцагнаві, 18 ст., арх. Н.Фарэтыч). Сярод жывапісцаў Л.М. і В.Дабрычэвічы (15—16 ст.), Дж.Мітрафанавіч, Т.Каколя (17—18 ст.). Жывапісцы сям'і Дзіміт-рыевічаў-Рафайлавічаў спалучалі познавізант. традыцыі з асобнымі барочнымі прыёмамі. Пасля 1878 у гарадах будаваліся ў духу ампіру. З рэгулярнай планіроўкай узведзены г. Падгорыца. Грамадскія будынкі канца 19 — пач. 20 ст. ў стылях эклектыкі і неавізантыйскім. Жылыя дамы пераважна з нечасанага каменю з чарапічнымі дахамі і невял. аконнымі праёмамі. У 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. ў выяўл. мастацтве сфарміраваўся нац. кірунак. У 1920—30-я г. М.Мілунавіч і П.Лубарда працавалі ў духу постімпрэсіянізму, вылучаліся работы скульптара Р.Стыёвіча. Пасля 2-й сусв. вайны распрацоўваліся планы гарадоў, на адрыятычным узбярэжжы рэканструяваліся старыя і ўзводзіліся новыя добраўпарадкаваныя гарады з курортнымі комплексамі (асабліва пасля землетрасення 1979). У выяўл. мастацтве вылучаліся нац. пейзажы і нацюрморты Мілунавіча, А.Прыйіча, гіст. кампазіцыі Лубарды. У пошуках маладых мастакоў існуюць рэаліст. традыцыі і тэндэнцыі мадэрнізму.

Музыка. Геагр. ізаляванасць Ч. спрыяла захаванню самабытнасці нац. муз. фальклору да 19 ст., але і перашкаджала развіццю прафес. музыкі. Да пач. 20 ст. асн. жанры — нар. песні, у т.л. эпічныя, гераічныя (у суправаджэнні нар. муз. інструмента гусле), лірычныя, абрадавыя, у т.л. жаночыя песні-плачы тужбаліцы. Пашыраны нар. танец ора (разнавіднасць кола). У канцы 19 ст. ўзніклі аматарскія хар. т-вы, у т.л. Рамесніцкае (1904; у 1909 на яго аснове створаны Нац. т-р у г. Цэтыне). Першыя прапагандысты зах.-еўрап. класічнай музыкі — ваен. аркестры. Значная роля ў развіцці музыкі канца 19 — пач. 20 ст. чэха Р.Толінгера, італьянца Д. дэ Сарне Сан-Джорджыо, нац. кампазітараў-аматараў Ш.Агненавіча, М.Негаша. Першы прафес. кампазітар Ч. — І.Іванішавіч, аўтар музыкі Нац. гімна, арк. і фп. п'ес, маршаў і інш. У 1920-я г. адкрыты спец. муз. навуч. ўстановы ў Цэтыне і Падгорыцы. Сярод муз. дзеячаў 1-й пал. 20 ст.: хормайстар і педагог А.Іванавіч; кампазітар, фалькларыст, хормайстар І.Мілошавіч. З 1940-х г. музыка Ч. развівалася ў межах югасл. музыкі. Створаны сімф. аркестр і мяшаны хор радыё ў Цітаградзе (1949), дзярж. ансамбль нар. песні і танца «Ора». Арганізаваны т-вы кампазітараў і музыкантаў-выканаўцаў, саюз культ.-маст. т-ваў.

Літ.: История Югославии. Т. 1—2. М., 1963. *В.А.Сімакова і М.С.Даўгяла* (гісторыя).

ЧАРНАЗЁМЫ, тып *глеб*, які фарміруецца ў лесастэпавай і стэпавай зонах умераных паясоў пад шматгадовай тра-

1 2

Чарнакорань: 1 — пурпурны; 2 — голы.

вяністай расліннасцю. Развіваюцца пераважна на карбанатных пародах пры недахопе ўвільгатнення, ва ўмовах непрамыўнога ці перыядычна прамыўнога воднага рэжыму. Для Ч. характэрны нейтральная ці слабакіслая рэакцыя глебавага раствору, зярністая ці камякавата-зярністая структура, назапашванне арган. рэчываў у моцным (да 1 м) гумусавым слоі, высокая патэнцыяльная ўрадлівасць. Плошча Ч. у свеце каля 240 млн. га. Пашыраны ў Еўразіі (Аўстрыя, Венгрыя, Балгарыя, Малдова, Паўд. Украіна, Расія, Манголія, Кітай), Паўн. (зах. штаты ЗША, паўд. правінцыі Канады) і Паўд. Амерыцы (Паўд. Аргенціна і Чылі). На Беларусі адсутнічаюць.

ЧАРНАКЛЁН, кветкавая расліна, гл. ў арт. *Клён*.

ЧАРНАКО́РАНЬ (Scorzonera), род кветкавых раслін сям. складанакветных. Каля 170 відаў. Пашыраны пераважна ў засушлівых і горных абласцях Еўразіі. На Беларусі 3 віды Ч.: прысадзісты (S. humilis) і занесеныя ў Чырв. кнігу — голы (S. glabra) і пурпурны (S. purpurea). Трапляюцца ў лясах, на вільготных лугах. Як агароднінную культуру культывуюць Ч. іспанскі (S. hispanica), т.зв. салодкі корань.

Двух- і шматгадовыя травяністыя расліны і паўкусты, голыя або апушаныя, маюць млечны сок. Карані часта верацёна- ці клубнепадобна патоўшчаныя, у многіх відаў ядомыя. Лісце чаргаванае, суцэльнакрайняе або перыста-надрэзанае. Кветкавыя кошыкі пераважна адзіночныя, усе кветкі язычковыя. Плод — сямянка. Карані Ч. маюць *інулін*, выкарыстоўваюцца пры лячэнні цукр. дыябету. Падземныя ч. некат. відаў (напр., таў-сагыз) маюць у сабе каўчук. Лек. агародніннyя, каўчуканосныя, меданосныя і дэкар. расліны.

ЧАРНАМО́РСКАЕ КАЗА́ЦКАЕ ВО́ЙСКА, войска, створанае царскім урадам у Паўд. Украіне з б. запарожскіх казакоў (*Запарожская Сеч* ліквідавана ў 1775). Яго арганізацыя пачалася ўвосень 1787 (у сувязі з набліжэннем новай вайны з Турцыяй). Указам ад 2.2.1788 утворана т.зв. «Войска надзейных казакоў», якое ў гэтым жа годзе перайменавана ў Ч.к.в. Паміж Паўд. Бугам і Днястром казакі заснавалі некалькі пасёлкаў з цэнтрам у г. Слабадзея (цяпер г.п. Слабазія ў Малдове). Пасля рус.-тур. вайны 1787—91 Ч.к.в. ў 1792 перасялілі на т.зв. Чарнаморскую пагран. лінію (ад вусця р. Лаба да Азоўскага м. па правым беразе р. Кубань). На Кубані казакі заснавалі 40 куранёў з ваен.-адм. цэнтрам у г. Екацярынадар (цяпер г. Краснадар). У сярэдзіне 19 ст. Ч.к.в. (каля 200 тыс. чал.) складалася з 12 конных палкоў, 9 пластунскіх (пешых) батальёнаў, 2 гвардз. эскадронаў і 4 батарэй. Вялі таксама гаспадарчую дзейнасць (жывёлагадоўля, рыбалоўства, з 1840 — земляробства). У 1860 Ч.к.в. аб'яднана з часткай Каўк. лінейнага казацкага войска і перайменавана ў Кубанскае казацкае войска.

ЧАРНАМО́РСКАЕ ЎЗБЯРЭ́ЖЖА КАЎКА́ЗА, частка ўсх. ўзбярэжжа Чорнага м., што працягваецца на 600 км ад г. Анапа (Расія) да мяжы Грузіі з Турцыяй. На Пн абмежавана адгор'ямі Вял. Каўказа, на Пд — Калхідскай нізінай і адгор'ямі М. Каўказа. Клімат субтрапічны, у паўн.-зах. частцы (да г. Туапсэ) міжземнаморскага тыпу, з сухім летам (сярэднія т-ры ліп. 23 °С, студз. 3 °С), у паўд.-ўсх. — субтрапічны вільготны (сярэднія т-ры ліп. 24 °С, студз. 5 °С). Ападкаў за год ад 500 мм на Пн да 2800 мм на Пд. На Пн лясы і ксерафітныя хмызнякі тыпу шыбляку. На Пд шыракалістыя лясы з каштану, грабу, буку і інш. з ліянамі і вечназялёнымі хмызнякамі ў падлеску. Шматлікія насаджэнні

цытрусавых, плантацыі чаю, тытуню, вінаграднікі. Адзін з найб. папулярных турысцкіх і курортных рэгіёнаў Расіі і Грузіі (з прычыны *грузіна-абхазскага канфлікту 1990-х г.* курорты Грузіі ў заняпадзе); курортны сезон 140 дзён. Уключае клімат. і бальнеалагічныя курорты *Анапа, Геленджык, Сочы, Гагра, Гудаута, Сухумі, Кабулеці, Батумі* і інш., воз. *Рыца, Каўказскі запаведнік, Піцунда-Мюсерскі запаведнік* і інш., шматлікія літ.-мемарыяльныя і гісторыка-культ. мясціны і музеі.

Літ.: Пачулиа В.П. Черноморское побережье Кавказа. М., 1980.

ЧАРНАМО́РСКІ ЗАПАВЕ́ДНІК біясферны. У Херсонскай і Мікалаеўскай абл. Украіны. Уключае ўчасткі ўзбярэжжа і шэраг астравоў у заліве Чорнага мора. Засн. ў 1927 для аховы стэпавых ландшафтаў, водна-балотных угоддзяў, месцаў гнездавання і зімоўкі вадаплаўных птушак. Пл. 57 тыс. га.

Рэльеф раўнінны. Клімат умерана-кантынентальны. Глебы пераважна саланчакі і саланцы. Участкі саланчаковых і пясчаных стэпаў, дубовыя, бярозавыя, асінавыя і чорнальховыя гаі і інш. Гняздуюцца чайкі, кручкі, кулікі, пастушковыя і галянастыя птушкі, драфа, арлан-белахвост, стрэпет; зімуюць лебедзі клікун і шыпун, свіязі, крыжанкі і інш.

ЧАРНАМО́РСКІЯ ПРАЛІ́ВЫ, агульная назва праліваў *Басфор, Дарданелы* і размешчанага паміж імі *Мармуровага мора*. Паводле міжнар. канвенцыі (*Мантро канферэнцыя 1936*) караблі чарнаморскіх краін (калі яны не ў стане вайны) выкарыстоўваюць зону Ч.п. без абмежаванняў, нечарнаморскіх краін — з абмежаваннямі паводле класа, водазмяшчэння і тэрміну знаходжання ў Чорным моры.

ЧАРНАМЫ́РДЗІН Віктар Сцяпанавіч (н. 9.4.1938, с. Чорнае Адгор'е Арэнбургскай вобл., Расія), расійскі дзярж. і паліт. дзеяч. Скончыў Політэхн. ін-т у г. Самара (1966), працаваў на Орскім нафтаперапрацоўчым з-дзе. З 1967 у Орскім гаркоме КПСС, з 1973 дырэктар Арэнбургскага газаперапрацоўчага з-да, з 1978 у апараце ЦК КПСС. У 1982—83 нам. міністра газавай прам-сці СССР, з 1983 нач. Усесаюзнага прамысл. аб'яднання па здабычы газу ў Цюменскай вобл., у 1985—89 міністр газавай прам-сці СССР, з 1989 старшыня праўлення Дзярж. газавага канцэрна «Газпрам». У маі—снеж. 1992 нам. старшыні, у снеж. 1992 — сак. 1998 старшыня ўрада Рас. Федэрацыі. У 1990-я г. адначасова лідэр руху «Наш дом Расія». З 2001 пасол Рас. Федэрацыі на Украіне.

ЧАРНАПЛО́ДНАЯ РАБІ́НА, аронія чарнаплодная (Aronia melanocarpa), кветкавая расліна сям. ружавых. Пашырана ва ўмераным поясе Паўн. Амерыкі. Уведзена ў культуру з пач. 18 ст., на Беларусі з 1937. Вырошчваецца як харч. расліна, часам дзічэе.

Лістападны галінасты куст выш. 1,5—3 м. Лісце шырокаэліптычнае, бліскучае. Кветкі ў

Чарнаплодная рабіна.

верхавінкавых шчыткападобных густых суквеццях. Плод — яблыкападобны, чорны, сакаўны, ядомы. Плады багатыя катэхінамі, антацыянамі, флаваноідамі, вітамінамі і мікраэлементамі; выкарыстоўваюць у харч. і мед. прам-сці, спажываюць у ежу. Лек., харч., дэкар., меданосная расліна. *В.М.Прохараў.*

ЧАРНАРУ́ЧЧА, вёска ў Шклоўскім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 23 км на З ад горада і чыг. ст. Шклоў, 53 км ад Магілёва. 279 ж., 117 двароў (2003). Сярэдняя школа, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі.

ЧАРНАСО́ЦЕНЦЫ (ад стараж.-рус. «чорная сотня» — цяглае пасадскае насельніцтва), члены крайне правых арг-цый у Расіі ў 1901—17, якія выступалі супраць сацыялізму, лібералізму і нац.-выз. рухаў пад лозунгамі манархізму, адзінай непадзельнай Рас. імперыі. Мянушку ім далі паліт. праціўнікі, якія лічылі іх выразнікамі поглядаў найб. адсталых пластоў гар. мяшчанства; самі Ч. пагадзіліся з такой мянушкай, бо лічылі просты народ («чорную сотню») носьбітам найлепшых, на іх погляд, якасцей — рус. патрыятызму, адданасці самадзярж. цару і правасл. веры. Ч. аб'ядноўвалі прадстаўнікоў розных пластоў грамадства, але сярод кіраўнікоў пераважалі памешчыкі, чыноўнікі, вышэйшае духавенства і інтэлігенцыя. У ліку іх лідэраў і ідэолагаў А.І.*Дубровін*, У.М.*Пурышкевіч*, М.Я.Маркаў. Першая арг-цыя Ч. — «Рускі сход» — засн. ў студз. 1901 В.Л. і К.І.Вялічкамі, А.С.Суворыным і інш. У 1905 узніклі «Саюз рускіх людзей», «Руская манархічная партыя», «*Саюз рускага народа*», ад якога ў 1908 адкалоўся ультраправы «*Саюз Міхаіла Архангела*». У гады рэвалюцыі 1905—07 Ч. падтрымлівалі ўрадавыя рэпрэсіі, наладжвалі пагромы, у т.л. ў Адэсе, Іванава-Вазнясенску, Яраслаўлі. Найб. размаху рух Ч. дасягнуў у 1907—08, калі налічваў каля 500 тыс. членаў. Пазней ён аслаблены шэрагам расколаў, забаронай святарам удзельнічаць у паліт. рухах (1913), рэв. уздымам 1912—14. Пасля Люг. рэвалюцыі 1917 арг-цыі Ч. забаронены.

На Беларусі чарнасоценны рух у значнай ступені быў рэакцыяй на афармленне ў краі масавага рэв.-дэмакр. і *беларускага нацыянальна-вызваленчага руху*. Ч. разглядалі яго пераважна як нац. паўстанне яўрэяў і палякаў супраць рас. дзяржаўнасці, таму нацкоўвалі праваслаўных на яўрэяў і католікаў. У 1905—07 мясц. арг-цыі рас. чарнасоценных саюзаў і партый налічвалі каля 20 тыс. чал. (пераважна ў Мінскай і Магілёўскай губ.). У кастр. 1906 у выніку аб'яднання мясц. арг-цый «Саюза рускага народа» і *акцябрыстаў* Віленскай, Віцебскай, Магілёўскай, Гродзенскай і Мінскай губ. узнік «*Рускі ўскраінны саюз*».

Літ.: Кожинов В. «Черносотенцы» и Революция: (загадочные страницы истории). 2 изд. М., 1998; Забаўскі М.М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906—1917 гг.). Мн., 1999.

ЧАРНАСО́ШНЫЯ СЯЛЯ́НЕ, у Расіі 14—17 ст. катэгорыя феадальна залежнага, але асабіста свабоднага сельскага насельніцтва, якое жыло на дзярж. («чорных») землях і эксплуатавалася непасрэдна дзяржавай. Кіравалі імі дзярж. чыноўнікі і выбарныя органы з саміх сялян. Ворыва і частка інш. угоддзяў знаходзіліся ў прыватна-долевым карыстанні сял. сем'яў; пашы, лясы і рэкі — у абшчынна-валасным карыстанні. Ч.с. мелі больш эканам. свабоды, чым прыватнаўласніцкія, займаліся разнастайнымі промысламі (солеварэнне, рыбацтва, паляванне і інш.). Сістэматычная раздача маскоўскімі вял. князямі (потым царамі) населеных дзярж. зямель *памешчыкам* прывяла да значнага скарачэння колькасці Ч.с. У канцы 17 ст. іх заставалася каля 50 тыс. двароў, пераважна на Еўрап. Поўначы і ў Сібіры. У пач. 18 ст. Ч.с. ўвайшлі ў катэгорыю *дзяржаўных сялян*.

ЧАРНАСПІ́НКА, волжскі селядзец (Alosa kessleri), рыба сям. селядцовых. Пашырана ў Каспійскім моры. Нераст у рэках Волга і Урал.

Даўж. да 52 см, маса да 1,8 кг. Спіна, галава і грудныя плаўнікі амаль чорныя (адсюль назва) або цёмна-фіялетавыя. За жабернымі накрыўкамі з кожнага боку па пляме. Жаберныя тычынкі тоўстыя і грубыя. Прахадная. Пасля нерасту ч. рыб гіне. Корміцца дробнай рыбай. Аб'ект промыслу. Іл. гл. да арт. *Селядцовыя*.

ЧАРНА́ТАЎ Вячаслаў Міхайлавіч (н. 11.8.1939, г. Амурск Хабараўскага краю, Расія), бел. архітэктар і даследчык архітэктуры. Канд. архітэктуры (1998). Скончыў БПІ (1967). Працаваў у ін-це «Белдзіпрагандаль», Спец. навук.-рэстаўрацыйных вытв. майстэрнях Мін-ва культуры Беларусі, у 1975—99 гал. архітэктар праектаў у БелНДІдзіпрасельбудзе. З 1981 выкладае ў Бел. нац. тэхн. ун-це. Асн. работы: гандл. цэнтр (1971, 1-я чарга) і адм. будынак фірмы «МАВ» (2002, з В.Малышкіным) у г. Дзяржынск, рэстаран «Бярэзіна» ў г. Барысаў Мінская вобл. (1975, з У.Сарочкіным), будынак навуч. корпуса Ін-та ўпраўлення і прадпрымальніцтва па вул. Славінскага ў Мінску (2001); у аўт. калектыве — праект рэгенерацыі гіст. цэнтра Магілёва, ахоўная зона і зона рэгулявання арх. помніка пач. 20 ст. ў в. Лясная Слаўгарадскага р-на Магілёўскай вобл. (абедзве 1974), серыя тыпавых праектаў жылых і грамадскіх будынкаў для малых гарадоў і сельскай мясцовасці (1975—88). Даследуе бел. архітэктуру 2-й пал. 19—20 ст. Аўтар кніг «Сынам Айчыны» (1980), «Георгій Заборскі» (1998), «Абрам Духан» (2002). Адзін з аўтараў кн. «Гісторыя беларускага мастацтва» (т. 3, 1989), «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» (т. 1—7, 1984—88), «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць» (1990). Аўтар-складальнік бібліягр. даведніка «Архітэктары Савецкай Беларусі» (1991, у сааўт.).

Тв.: Памятники воинской славы на белорусской земле (XIX — нач. XX в.). Мн., 1976.

ЧАРНА́ЎКА, рака ў Гарадоцкім і Шумілінскім р-нах Віцебскай вобл., левы прыток р. Обаль (бас. Зах. Дзвіны). Даўж. 32 км. Пл. вадазбору 220 км². Выцякае з воз. Чарнова, за 500 м на Пн ад в. Касцянава Гарадоцкага р-на, цячэ ў межах Гарадоцкага ўзв. і Полацкай нізіны, праз воз. Малое Чарнова. Вусце каля в. Скаціца Шумілінскага р-на. Асн. прыток — р. Бярноўка (справа). Даліна ў вярхоўі вузкая (шыр. 150—200 м), у сярэднім і ніжнім цячэнні невыразная, пойма двухбаковая. Рэчышча ў сярэднім цячэнні на працягу 8,4 км каналізаванае, шыр. да 5 м, у вусці да 12 м.

ЧАРНАЎЦЫ́, горад, цэнтр Чарнавіцкай вобл. Украіны, у перадгор'ях Карпат, на р. Прут. Вядомы з 1408. Да 1944 наз. Чарнавіцы, 259 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Прам-сць: лёгкая

Чарнаўцы. У цэнтры горада.

(трыкат., швейная, абутковая), машынабудаванне і металаапрацоўка (абсталяванне для лёгкай прам-сці, электрапрылады і інш.), харч. (мясная, алейная, цукр.), хім., дрэваапр., у т.л. мэблевая; вытв-сць буд. матэрыялаў, маст. вырабаў. Ун-т (з 1875), мед. ін-т. Муз.-драм. тэатр, філармонія. Музеі: краязнаўчы, нар. архітэктуры і побыту, літ.-мемарыяльны В.Ю.*Кабылянскай* і Ю.А.*Фядзьковіча*. Арх. помнікі: драўляныя цэрквы 17—18 ст., будынак ун-та (19 ст.) і інш.

ЧАРНА́ЎЧЫЦКІ ТРО́ІЦКІ КАСЦЁЛ, помнік архітэктуры готыкі і рэнесансу ў в. *Чарнаўчыцы* Брэсцкага р-на. Пабудаваны ў 1595 па фундацыі М.К.Радзівіла Сіроткі. Аднанефавы мураваны храм зальнага тыпу з рудыментам трансепта і развітай паўкруглай апсідай, да якіх прылягаюць квадратныя ў плане больш

Чарнаўчыцкі Троіцкі касцёл.

нізкія прыбудовы з 1-схільнымі дахамі. З паўд. боку да апсіды прылягае круглая ў плане вежа з шатровым пакрыццём. Да гал. фасада прыбудаваны бабінец. Асн. аб'ём і апсіда накрыты высокім 2-схільным дахам з трохвугольнымі шчытамі на тарцах. Шчыт на гал. фасадзе аздоблены плоскімі прамавугольнымі і круглымі нішамі, тонкімі карнізамі, верт. цягамі.

Атынкаваныя масіўныя сцены (таўшчыня 1,3 м) бакавых фасадаў умацаваны контрфорсамі. Аконныя праёмы паўцыркульныя з прафіляванымі карнізамі. Унутры цыліндрычныя скляпенні на распалубках дэкарыраваны ляпнымі рэбрамі прыгожага геам. малюнка. У інтэр'еры 3 барочныя драўляныя паліхромныя скульптуры 18 ст. У рызніцы захоўваецца арнат, аблямаваны слуцкім поясам. На ПнЗ ад касцёла на высокім цокалі 3-ярусная званіца пад шатровым дахам. У працэсе архітэктурна-археал. даследаванняў установлена, што сакрыстыя, рызніца і вежа прыбудаваны ў 17 ст.

А.М.Кушнярэвіч, Л.Г.Лапцэвіч, У.А.Чантурыя.

ЧАРНА́ЎЧЫЦЫ, вёска ў Брэсцкім р-не на аўтадарозе Брэст—Камянец. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 18 км на ПнУ ад Брэста. 2380 ж., 884 двары (2003). З-д жалезабетонных вырабаў, ПМК-55, вучэбны цэнтр Брэсцкага аблсельгасхарча. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Магіла ахвяр фашызму. Помнікі архітэктуры: *Чарнаўчыцкі Троіцкі касцёл*, Свята-Параскева-Пятніцкая (Пакроўская) царква (1733).

Вядомы з пач. 15 ст. У 1421 у Ч. заснаваны касцёл. У 1487 баярын Іван Іллініч абмяняў свае вотчыны на дзярж. маёнтак Ч., які заставаўся ў родзе Іллінічаў да 2-й пал. 16 ст. Пасля смерці ў 1569 Юрыя Іллініча Ч. перайшлі да Радзівілаў, да пач. 19 ст. Чарнаўчыцкае графства — цэнтр радзівілаўскага маёнтка. У 16—18 ст. мястэчка ў Брэсцкім пав. ВКЛ. Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) у Рас. імперыі, у Брэсцкім пав. Слонімскай, з 1797 Літоўскай, з 1801 Гродзенскай губ. У 1886 — 574 ж., 71 двор, школа, 2 правасл. царквы, яўр. малітоўны дом, сінагога. З 1921 у Польшчы, вёска ў Турненскай гміне Брэсцкага пав. Палескага ваяв., 149 ж. (1921). З 1939 у складзе БССР, з 15.1.1940 вёска ў Брэсцкім р-не, з 12.10.1940 цэнтр сельсавета. *В.С.Паздняковў (гісторыя).*

ЧАРНАЦЕ́ЛКІ (Tenebrionidae), сямейства жукоў падатр. разнаедных. Больш за 17 тыс. відаў. Пашыраны амаль усюды, найб. разнастайныя і шматлікія ў стэпах, пустынях і паўпустынях. Жывуць на адкрытых біятопах, на берагах вадаёмаў, у лясах, жылых і спец. памяшканнях і інш. На Беларусі 53 віды. Найб. пашыраны віды з родаў павольнік (Blaps), апатрум (Opatrum), тэнэбрыё (Tenebrio) і інш.

Даўж. 2—70 мм. Форма цела разнастайная. Афарбоўка цёмная: чорная, бурая, зрэдку з ярка-метал. адлівам або з аранжавымі плямамі. Надкрылы зрастаюцца, задніх крылаў часта няма. Вусікі 10—11-члянікавыя. Лічынкі доўгія, амаль цыліндрычныя, цвёрдыя, нагадваюць *драцянікаў* (адсюль назва лжэдрацянікі). Кормяцца расл. рэшткамі, тканкамі жывых раслін. Шэраг відаў пашкоджваюць харч., с.-г. культуры, радзей лясныя пароды дрэў. Іл. гл. таксама да арт. *Хрушчакі мучныя.*

С.Л.Максімава.

ЧАРНЕ́ВІЧ Станіслаў (15.8.1728, с. Шламава каля г. Каўнас, Літва — 20.7.1785), каталіцкі рэлігійны дзеяч. Чл. ордэна езуітаў з 1743. У 1747—50 вывучаў тэалогію ў Вільні, Мінску і Слуцку, потым да 1757 — у Віленскім ун-це. У 1756 пасвячоны ў ксяндза. У 1759—68 у Рыме, сакратар і пракуратар Польскай правінцыі езуітаў пры генерале ордэна В.Рычы. З 1768 на Беларусі. У 1772, калі да Рас. імперыі была далучана ўсх. Беларусь, стаў рэктарам Полацкага езуіцкага калегіума. З 15.10.1773 віцэ-правінцыял езуітаў на далучанай да Расіі ч. Беларусі. У ліст. 1773 ён з Г.Лянкевічам і Ю.Катэнбрынгам ад імя ўсіх езуітаў, у

С.Чарневіч.

Чарнацелкі: 1 — гіганцкая; 2 — губавая; 3 — закаспійская; 4 — кукурузная; 5 — пясчаная. Павольнікі: 6 — падвальны; 7 — стэпавы; 8 — Фауста.

т.л. замежных, прысягнулі Кацярыне II, чым дамагліся легалізацыі дзейнасці езуітаў у Рас. імперыі. У студз. 1774 Кацярына II вызваліла езуітаў ад падаткаў і забараніла не толькі абвяшчаць, але і прывозіць у Расію булу рымскага папы Клімента XIV аб забароне ордэна езуітаў (1773). У 1780 Ч. дамогся адкрыцця ў Полацку езуіцкага навіцыяту, што вырашыла праблему пераемнасці кадраў у ордэне. Шмат увагі аддаваў дзейнасці школ. *Т.Б.Бліновa.*

ЧАРНЕ́ВІЧЫ, вёска ў Барысаўскім р-не Мінскай вобл., на аўтадарозе Барысаў—Бярэзіно. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 25 км на ПдУ ад горада і 30 км ад чыг. ст. Барысаў, 96 км ад Мінска. 354 ж., 124 двары (2003). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЧАРНЕ́ВІЧЫ, вёска ў Празароцкім с/с Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл., на р. Авута. Цэнтр калгаса. За 50 км на ПнУ ад г. Глыбокае, 160 км ад Віцебска, 15 км ад чыг. ст. Зябкі. 418 ж., 184 двары (2003). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — Свята-Параскева-Пятніцкая царква (1887). Каля вёскі курганны могільнік (9—11 ст.).

ЧАРНЕ́НКА Канстанцін Усцінавіч (24.9.1911, с. Вял. Цесь Навасёлкаўскага р-на Краснаярскага краю, Расія — 10.3.1985), савецкі паліт. і дзярж. дзеяч. Тройчы Герой Сац. Працы (1976, 1981, 1984). Скончыў Вышэйшую школу парт. арганізатараў пры ЦК ВКП(б) (1945), Кішынёўскі пед. ін-т (1953). З 1929 на кіруючай камсамольскай, сав. і парт. рабоце ў Краснаярскім краі, Пензенскай вобл. і Малдавіі, з 1956 — у апараце ЦК КПСС. Сакратар ЦК КПСС (1976—84), чл. Палітбюро ЦК КПСС (з 1978). З лют. 1984 ген. сакратар ЦК КПСС, адначасова з крас. 1984 старшыня Прэзідыума Вярх. Савета СССР.

ЧАРНЕ́ННЕ, н і е л а (італьян. niello ад лац. niger чорны), 1) утварэнне на паверхні метал. вырабаў тонкай аксіднай (вырабы са сталі, чыгуну) або сульфіднай (сярэбраныя вырабы) плёнкі. Робіцца для павышэння каразійнай устойлівасці або ў дэкаратыўных мэтах.

Найб. пашырана Ч. сталі апусканнем у канцэнтраваныя растворы шчолачы, якія ў якасці акісляльніку маюць нітрат або нітрыт натрыю. Аптымальная таўшчыня плёнкі 0,6—0,8 мкм. Ч. сталі — разнавіднасць *варанення*. Гл. таксама *Аксідаванне*.

2) Тэхніка аздаблення метал. вырабаў, пераважна сярэбраных; вырабы ў гэтай тэхніцы. Гравіраваны малюнак або фон запаўняюць тоўчаным чэрневым сплавам (серабро, медзь, сера і інш.), абпальваюць, потым шліфуюць. Вядома з ант. часоў. Шырока ўжывалася ў рас. ювелірным мастацтве: вялікаўсцюгскае

Да арт. **Чарненне**. Сярэбраны паднос. Масква. 1884.

Ч. на серабры (Валагодская вобл.), у маст. промысле апрацоўкі металу (у Дагестане кубачынскае Ч.). На Беларусі вядома з 11—13 ст., выкарыстоўвалася для аздаблення ювелірных вырабаў, звычайна спалучалася з *ліццём, чаканкай, гравіраваннем*, зярненнем, штампоўкай і інш. відамі маст. апрацоўкі металаў. У 14—18 ст. Ч. аздаблялі посуд, зброю, аклады кніг і абразоў. Бел. майстры «чэрневай справы» М.Сямёнаў, Ф.Мікулаеў і інш. працавалі ў Аружэйнай, Сярэбранай і Залатой палатах Маскоўскага Крамля. У наш час Ч. выкарыстоўваюць для аздаблення некат. ювелірных вырабаў.

Літ.: Постникова-Лосева М.М., Платонова Н.Г., Ульянова Б.Л. Русское черневое искусство. М., 1972.

Я.М.Сахута.

ЧАРНЕ́ЦЬ, К о п а н ь, рака ў Беларусі і Расіі, на мяжы Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл. і Пскоўскай вобл., у бас. р. Зах. Дзвіна. Даўж. 22 км. Пл. вадазбору 132 км^2. Пачынаецца за 3 км на ПнЗ ад в. Ключагорская Гарадоцкага р-на, цячэ праз воз. Існа, упадае ў воз. Вялікае Свіно з Пн, каля в. Чухіліна Гарадоцкага р-на. Цячэ па лясістай мясцовасці.

ЧАРНІ́ГАЎ, горад, цэнтр Чарнігаўскай вобл. Украіны. 311 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог, порт на р. Дзясна

Пятніцкая царква ў **Чарнігаве**.

(бас. р. Дняпро). Прам-сць: лёгкая (шарсцяная, абутковая, швейная), харч. (мясная, малочная, кандытарская), машынабудаванне і металаапрацоўка (радыёпрылады, інструменты; рамонт с.-г. машын), хім., паліграф., дрэваапр., у т.л. мэблевая; вытв-сць муз. інструментаў, буд. матэрыялаў. Пед. ін-т. 2 тэатры, у т.л. драматычны. Музеі: гіст., маст., нар. дэкар. мастацтва, М.М.*Кацюбінскага*. Арх.-гіст. запаведнік: *Чарнігаўскі Спаса-Праабражэнскі сабор*, Барысаглебскі (12 ст.) сабор; Пятніцкая царква (12—13 ст.); ансамблі Ялецкага (17 ст.; з Успенскім саборам, 12 ст.) і Троіцкага (17—18 ст.) манастыроў.

У 9 ст. цэнтр *севярян*. Упершыню ўпамінаецца ў летапісе пад 907. З 10 ст. ў складзе Кіеўскай Русі. У 1024—36 і 1054—1239 эканам. і паліт. цэнтр *Чарнігаўскага княства*. У 1239 разбураны мангола-татарскімі войскамі *Батыя*. З 2-й пал. 14 ст. ў складзе ВКЛ. У выніку *вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1500—03* разам з Чарнігава-Северскай зямлёй адышоў да Рас. дзяржавы. Паводле *Дэулінскага перамір'я 1618* у складзе Рэчы Паспалітай, у 1623 атрымаў магдэбургскае права. Жыхары Ч. ўдзельнічалі ў вызв. вайне ўкр. і бел. народаў 1648—54; летам 1648 горад захоплены паўстанцамі, цэнтр Чарнігаўскага казацкага палка. Паводле *Андросаўскага перамір'я 1667* у складзе Рас. дзяржавы. З 1679 у Ч. дзейнічала друкарня, з 1700 — калегіум. З 1782 цэнтр Чарнігаўскага намесніцтва, з 1797 Малярасійскай, з 1802 Чарнігаўскай губ. У грамадз. вайну акупіраваны войскамі герм. (сак. 1918 — студз. 1919), Дзянікіна (кастр.—ліст. 1919). З 1925 цэнтр акругі, з 1932 — вобласці. У Вял. Айч. вайну акупіраваны (1941) ням. фашыстамі. Вызвалены Чырв. Арміяй у выніку *Чарнігаўска-Прыпяцкай аперацыі 1943*.

ЧАРНІ́ГАЎ Уладзімір Дзмітрыевіч (23.8.1922, в. Хацяны Манастыршчынскага р-на Смаленскай вобл., Расія — 23.5.1985), бел. вучоны ў галіне ветэрынарыі. Д-р вет. н. (1974), праф. (1976). Скончыў Маскоўскі зоавет. ін-т (1948). З 1956 у Віцебскім вет. ін-це. Навук. працы па выпрацоўцы мер прафілактыкі інфекц. хвароб жывёл, метадаў вет.-сан. экспертызы прадуктаў жывёльнага і расл. паходжання.

ЧАРНІ́ГАЎСКАГА ПАЛКА́ ПАЎСТА́ННЕ, узброенае выступленне *дзекабрыстаў* на Украіне супраць самадзяржаўя 10—15.1.1826. Рыхтавалася *Паўднёвым таварыствам дзекабрыстаў*, якое разлічвала ўзняць каля 50 тыс. салдат і афіцэраў. Пачалося заўчасна ў сувязі з паражэннем паўстання ў Пецярбургу і арыштамі дзекабрыстаў на Поўдні. Кіраўнікі: падпалк. С.І.*Мураўёў-Апостал* і падпаручнік М.П.*Бястужаў-Румін*. Першай паўстала адна рота Чарнігаўскага палка (у в. Трылесы на ПдЗ ад Кіева), да якой далучыліся інш. роты. Прынятыя царскімі ўладамі захады перашкодзілі паўстанцам злучыцца з рэв. настроенымі часцямі ў Кіеве і Жытоміры. 15.1.1826 Чарнігаўскі полк разбіты ўрадавымі войскамі каля г. Белая Царква. Мураўёў-Апос-

тал і Бястужаў-Румін пакараны смерцю, 5 чал. прыгавораны да бестэрміновай катаргі, каля 100 салдат — да цялесных пакаранняў. *М.Г.Нікіцін.*

ЧАРНІ́ГАЎСКАЕ КНЯ́СТВА, старажытнарускае княства ў 11—13 ст. з цэнтрам у *Чарнігаве*. Займала тэр. па цячэнні р. Дзясна, Сейм, верхняй Акі, ніжняга Пасожжа і верхняга Падняпроўя. Уваходзілі гарады Ноўгарад-Северскі, Любеч, Сноўск, Пуцíўль, Рыльск, Курск, Старадуб, Трубецк, Бранск і інш. Склалася на землях *севяран, палян, радзімічаў* і *вяцічаў*. Уваходзіла ў склад *Кіеўскай Русі*. Чарнігаў вылучыўся з яе пры кн. Мсціславе Уладзіміравічу ў 1024—36. Пасля смерці Яраслава Мудрага (1054) Ч.к. належала яго сыну Святаславу Яраславічу, які княжыў у Чарнігаве да 1073. Рашэннем *Любецкага з'езда 1097* Ч.к. замацавана за яго нашчадкамі. У 1097 з Ч.к. вылучылася княства з цэнтрам у г. Ноўгарад-Северскі, у 12 ст. цэнтрамі ўдзельных княстваў сталі Пуцíўль, Рыльск, Трубчэўск, Курск, Ушчыж і інш. З 11 ст. ў Ч.к. ўваходзілі землі паўд. Пасожжа з г. Гомій (Гомель) і Чачэрск, верхняга Падняпроўя з г. Рэчыца. У 1160-я г. Гомій вылучыўся як цэнтр удзельнага княства. У сярэдзіне 12 ст. Ч.к. належалі таксама некаторыя дрыгавіцкія землі з г. Слуцк, Клецк, Рагачоў. У 1239 г. Чарнігаў спалены мангола-татарамі і Ч.к. як дзярж. ўтварэнне спыніла сваё існаванне. У 14 ст. чарнігаўскія землі ўвайшлі ў склад ВКЛ. У сярэдзіне 15 ст. вял. князь ВКЛ Казімір падараваў г. Чарнігаў кн. І.А.Мажайскаму. У выніку *вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1500—03* чарнігаўскія землі перайшлі да Масквы.

Літ.: Насонов А.Н. «Русская земля» и образование территории древнерусского государства. М., 1951; Зайцев А.К. Черниговское княжество // Древнерусские княжества X—XIII вв. М., 1975. *В.С.Пазднякоў.*

ЧАРНІ́ГАЎСКА-ПРЫ́ПЯЦКАЯ АПЕРА́ЦЫЯ 1943, наступальная аперацыя войск *Цэнтральнага фронту* (ген. арміі К.К.*Ракасоўскі*) 26.8—30.9.1943; 1-я частка *бітвы за Дняпро 1943*. Мэта аперацыі — разгром ням. войск на Ноўгарад-Северскім і Канатопскім напрамках, выхад да р. Дняпро. У пач. аперацыі ў склад фронту ўваходзілі 13-я, 48-я, 65-я, 60-я, 61-я, 2-я танк. і 16-я паветр. арміі. Ім процістаялі ням. 2-я армія і частка войск 9-й арміі групы армій «*Цэнтр*», частка войск 4-й танк. арміі групы армій «Поўдзень». 26 жн. сав. войскі 2-й танк. і 65-й армій, прарваўшы абарону праціўніка на гал. напрамку, авалодалі 27 жн. г. Сеўск і прасунуліся на 20—25 км. Войскі ж 60-й арміі да 31 жн. прасунуліся на 60 км і ўступілі на тэр. Украіны. Развіваючы гэты поспех, войскі левага крыла фронту выйшлі да р. Дзясна, фарсіравалі р. Сейм; 6 вер. яны вызвалілі г. Канатоп, 9 вер. — г. Бахмач, 15 вер. — г. Нежын. Войскі правага крыла таксама выйшлі да Дзясны і фарсіравалі яе; 16 вер. яны вызвалілі г. Ноўгарад-Северскі, 21 вер. — г. Чарнігаў, фарсіравалі р. Дняпро; 23 вер. вызвалілі г.п. Камарын і захапілі плацдарм на правым беразе р. Прыпяць. Войскі 48-й і 65-й армій, што наступалі на Гомельскім напрамку, захапілі 2 плацдармы на правым беразе р. Сож, 26 вер. вызвалілі г.п. Церахоўка. Значную дапамогу сав. войскам аказвалі партызаны, якія захапілі на Дняпры і Прыпяці некалькі пераправ, а таксама зрывалі перавозкі ням. войск у ходзе аперацыі «*Канцэрт*». У выніку Ч.-П.а. сав. войскі прасунуліся на 300 км на З, замацаваліся на занятых плацдармах, што садзейнічала вызваленню Беларусі і Правабярэжнай Украіны.

ЧАРНІ́ГАЎСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ. Размешчана на Пн Украіны. Мяжуе на ПнЗ з Беларуссю, на Пн з Расіяй. Утворана 15.10.1932. Пл. 31,9 тыс. км^2. Нас. 1264,5 тыс. чал. (2001), гарадскога 52%. Цэнтр — г. *Чарнігаў*. Найб. гарады: Нежын, Прылукі, Бахмач.

Большая ч. тэр. ў межах Прыдняпроўскай нізіны. Паверхня — хвалістая раўніна, нахіленая з ПнУ на ПдЗ. Карысныя выкапні: нафта і прыродны газ (*Дняпроўска-Данецкая газанафтаносная вобласць*), торф, жал. руда, фасфарыты, каменная соль, мінер. буд. матэрыялы. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад -6 да -8 °С, ліп. 18—20 °С. Ападкаў 500—600 мм за год. Гал. рака Дзясна з прытокамі Сейм, Убедзь, Сноў, Асцёр і інш.; уздоўж зах. мяжы вобласці працякае р. Дняпро. На тэр. вобласці ч. *Кіеўскага вадасховішча*. Глебы дзярнова-падзолістыя (на Пн), вышчалачаныя ападзоленыя і лугавыя чарназёмы (на Пд), шэрыя ападзоленыя і тарфяна-балотныя. Пад лесам каля 20% тэр., на Пн пераважаюць хваёвыя і мяшаныя, на Пд — ліставыя (дуб, бяроза, асіна, вольха) лясы. Дэндрапарк «Трасцянец» (на ПдУ).

Гал. галіны прам-сці: лёгкая (шарсцяныя тканіны, баваўняная пража, абутак, дываны, швейныя і галантарэйныя вырабы; першасная апрацоўка лёну), харч. (масласыраробная, цукр., мясная, алейная, плодаагароднінакансервавая, крухмала-патачная), машынабудаванне і металаапрацоўка (машыны для жывёлагадоўлі і камунальнай гаспадаркі, запчасткі для аўтамабіляў і с.-г. машын, абсталяванне проціпажарнае, для хім. і харч. прам-сці, радыёпрылады), хім. (лакі, фарбы, сінт. валакно, кордавая тканіна, пластмаса, гумавыя вырабы), лясная, дрэваапр. і цэлюлозна-папяровая. Вытв-сць электраэнергіі на Чарнігаўскай ЦЭС. Здабыча і перапрацоўка нафты і газу. Вытв-сць буд. матэрыялаў. Маст. промыслы (ганчарныя, керамічныя, драўляныя вырабы). Сельская гас-



падарка спецыялізуецца на вырошчванні збожжавых і тэхн. культур, бульбы, мяса-малочнай жывёлагадоўлі. Пад с.-г. ўгоддзямі 2160 тыс. га, асушана каля 240 тыс. га. Пасяўная пл. займае 1104 тыс. га (2000). Асн. збожжавыя культуры — пшаніца, кукуруза, грэчка, ячмень, жыта; тэхн. — цукр. буракі, сланечнік, лён-даўгунец, мята; кармавыя — кукуруза на сілас, канюшына і інш. Бульбаводства, агародніцтва. Садоўніц-

тва. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней, авечак. Птушкагадоўля. Пчалярства. Рыбалоўства. Даўж. чыгунак 892 км, аўтадарог з цвёрдым пакрыццём каля 7 тыс. км. Гал. чыгункі Масква—Кіеў, С.-Пецярбург—Кіеў, Гомель—Рамны, аўтадарогі С.-Пецярбург—Кіеў—Адэса, Масква—Кіеў. Суднаходства па Дняпры і Дзясне. Па тэр. вобласці праходзіць газаправод Дашава—Кіеў—Бранск—Масква. Кліматычны курорт Качанаўка.

ЧАРНІГАЎСКАЯ ГУБЕ́РНЯ, адм.-тэр. адзінка ў 1802—1925 на сумежных тэр. сучасных Украіны і Расіі. Цэнтр — г. *Чарнігаў*. Створана ў складзе Рас. імперыі, мела 15 паветаў: Асцёрскі, Барзнянскі, Гараднянскі, Глухаўскі, Казялецкі, Канатопскі, Кралявецкі, Мглінскі, Навазыбкаўскі, Нежынскі, Ноўгарад-Северскі, Сасніцкі, Старадубскі, Суражскі, Чарнігаўскі. Паводле перапісу 1897 пл. губерні 46 042 кв. вярсты, насельніцтва 3 321 900 чал. З іх украінцаў 86%, рускіх 6%, беларусаў 5%, яўрэяў 3%. Беларусы, паводле карты Я.Ф.*Карскага*, пражывалі пераважна ў Суражскім, Мглінскім, Старадубскім, Навазыбкаўскім, Гараднянскім пав. З 1917 у складзе Украіны. У 1919 Мглінскі, Навазыбкаўскі, Суражскі, Старадубскі пав. перададзены ў склад *Гомельскай губерні* РСФСР. Ч.г. скасавана пастановай ЦВК Украіны ад 3.6.1925, на яе тэр. створаны Глухаўская, Канатопская, Нежынская, Чарнігаўская акругі. *М.Г.Нікіцін.*

ЧАРНІГАЎСКАЯ ЗЯМЛЯ́, гл. ў арт. *Чарнігаўскае княства*.

ЧАРНІГАЎСКІ СПА́СА-ПРААБРАЖЭ́НСКІ САБО́Р, помнік архітэктуры 11—19 ст. у г. *Чарнігаў*. Упершыню згадваецца ў 1036. Буд-ва пачата пры кн. Мсціславе Уладзіміравічу Храбрым (тут і пахаваны). Узведзены з каменю і цэглы ў тэхніцы мяшанай муроўкі. План будынка перакошаны. Храм 3-нефавы 5-купальны. У 18 ст. на месцы разабраных старых прыбудоў узвялі паўд. вежу і надбудавалі паўн., у 19 ст. прыбудаваны прытвор, нанова размаляваны ін-

Чарнігаўскі Спаса-Праабражэнскі сабор.

тэр'ер; сабор цалкам рэстаўрыраваны. У муроўцы скляпенняў выяўлены галаснікі. У інтэр'еры захаваліся фрагменты фрэсак 11 ст. Іканастас 1793—98 (арх. І.Ясныгін, рэзчыкі С.Валошчанка, С.Белапольскі, жывапісец Г.Мызко). У 1926 каля сабора адкрыты падмуркі 2 капліц. *Г.А.Лаўрэцкі.*

ЧАРНІ́ЛЬНЫ МЯШО́К, чарнільная залоза, орган большасці *галаваногіх малюскаў*. Выконвае абарончую функцыю. Складаецца са складкаватай залозістай часткі, старыя клеткі якой пры разбурэнні выдзяляюць чорны пігмент *меланін*, і рэзервуара, дзе назапашваецца сакрэт. Пры небяспецы сакрэт выкідваецца праз анальную адтуліну ў ваду і ўтвараецца густое чорнае воблака, за якім хавацца. Сакрэт выкарыстоўваюць для вырабу фарбы *сепіі*, або кітайскай тушы.

ЧАРНІ́ЦА, рака ў Беларусі і Расіі, у Лёзненскім р-не Віцебскай вобл. і Смаленскай вобл., правы прыток р. Лучоса (бас. р. Зах. Дзвіна). Даўж. 74 км, у межах Беларусі — 70 км. Пл. вадазбору 775 км^2, у межах Беларусі каля 700 км^2. Пачынаецца за 1 км на Пд ад в. Ваўкі Руднянскага р-на Смаленскай вобл., вусце каля в. Бабінавічы Лёзненскага р-на. Асн. прытокі: Ціхута, Заальшанка (злева) і Мошна (справа). Даліна ў вярхоўі слабавыразная, на астатняй частцы трапецападобная (шыр. 200—400 м, на асобных участках да 100 м). Пойма пераважна двухбаковая, шыр. да 300 м. Рэчышча сяроднезвілістае (шыр. 5—10 м, у вусці да 20 м), на асобных участках разгаліноўваецца і ўтварае невял. астравы. На рацэ створана *Дабрамысленскае вадасховішча*. Рэчышча ў верхнім цячэнні на працягу 3,4 км каналізаванае.

ЧАРНІ́ЦА, рака ў Лагойскім р-не Мінскай вобл., правы прыток р. Цна (бас. р. Дняпро). Даўж. 31 км. Пл. вадазбору 167 км^2. Пачынаецца за 1 км на ПнЗ ад в. Становішча, вусце за 2 км на ПнЗ ад в. Чабатары. Асн. прыток — р. Мікалаеўшчына (справа). Цячэ па паўн.-ўсх. схілах Мінскага ўзвышша. Даліна пераважна трапецападобная, шыр. да 1,5 км. Схілы стромкія, выш. да 12 м, зрэдку абрывістыя. Пойма двухбаковая, забалочаная, у сяроднім цячэнні меліяраваная. Рэчышча на працягу 7,2 км каналізаванае, шыр. ад 5 да 10 м.

ЧАРНІ́ЦА, Чарніца Нагорная, рака ў Смалявіцкім р-не Мінскай вобл., правы прыток р. Пліса (бас. р. Дняпро). Даўж. 25 км. Пл. вадазбору 186 км^2. Пачынаецца з невял. сажалкі за 500 м на З ад в. Слабада, вусце на паўд.-зах. ускраіне в. Трубянок. Рэчышча каналізаванае.

ЧАРНІ́ЦА, рака ва Ушацкім і Докшыцкім р-нах, а таксама на мяжы Ушацкага і Глыбоцкага р-наў Віцебскай вобл., левы прыток р. Бярэзіна (бас. р. Дняпро). Даўж. 22 км. Пл. вадазбору 242 км^2. Пачынаецца на паўд. ускраіне в. Рагозіна Ушацкага р-на, вусце за 2 км на ПнЗ ад в. Беразіно Докшыцкага р-на. Рэчышча на працягу 3 км перад вусцем каналізаванае. Асн. прыток — р. Прыбойніца (злева). Цячэ пераважна праз забалочаны лес па Верхнебярэзінскай нізіне.

ЧАРНІ́ЦА, рака ў Іўеўскім р-не Гродзенскай вобл. і Валожынскім р-не Мінскай вобл., правы прыток р. Бярэзіна (бас. р. Нёман). Даўж. 22 км. Пл. вадазбору 207 км^2. Пачынаецца за 2 км на У ад в. Вайганы Валожынскага р-на, цячэ ў межах Лідскай раўніны, упадае ў Бярэзіну за 1,5 км на Пд ад хутара Будзішча. Рэчышча на працягу 19,2 км каналізаванае.

ЧАРНІ́ЦА, рака ў Шумілінскім р-не Віцебскай вобл., правы прыток р. Будавесць (бас. р. Зах. Дзвіна). Даўж. 21 км. Пл. вадазбору 152 км^2. Пачынаецца на паўд.-ўсх. ускраіне г.п. Шуміліна, вусце за 500 м на У ад в. Сідараўшчына. Прыток — Чорны ручай (справа). Цячэ ў межах Полацкай нізіны. Рэчышча каналізаванае.

ЧАРНІ́ЦКІ Яўген Аляксандравіч (26.7.1932, г. Рамны, Украіна — 1.4.1999), бел. вучоны ў галіне біяфізікі. Д-р біял. н. (1974), праф. (1989). Скончыў БДУ (1955). З 1955 у БСГА, з 1957 у Ін-це біялогіі АН Беларусі, з 1966 у Ін-це фотабіялогіі Нац. АН Беларусі (з 1974 заг. лабараторыі). Навук. працы па выкарыстанні люмінесцэнтных бялкоў у практыцы, аб механізмах фотаразбурэння клетак. Распрацаваў люмінесцэнтныя экспрэс-метады дыягностыкі саматычных захворванняў, метад фотарадыяцыйнай тэрапіі пухлін. Дзярж. прэмія Беларусі 1992.

Тв.: Люминесценция и структурная лабильность белков в растворе и клетке. Мн., 1972; Структура и функции эритроцитарных мембран. Мн., 1981 (разам з А.В.Вараб'ём); Спектральный люминесцентный анализ в медицине. Мн., 1989 (разам з К.І.Слабажанінай). *С.С.Мельнікаў.*

ЧАРНІ́ЦЫ (Vaccinium myrtillus), кветкавая расліна сям. бруснічных. Пашы-

Чарніцы.

раны ў Еўразіі і Паўн. Амерыцы. На Беларусі трапляюцца ў забалочаных лясах (характарызуюць асобныя тыпы лесу — чарнічнікі), утвараюць зараснікі.

Лістападны кусцік выш. 15—40 см з доўгім паўзучым карэнішчам. Галіны рабрыстыя, зялёныя. Лісце чаргаванае, дробнапілавата-зубчастае. Кветкі адзіночныя (рэдка па 2), зеленавата-белыя з ружаватым адценнем. Плод — чорна-шызая з васковым налётам сакаўная ядомая ягада. Спажываюць у ежу і як лек. сродак; корм для паўн. аленяў і птушак. Меданосная, лек., харч. і фарбавальная расліна.

ЧАРНІЧА́НКА, рака ў Бешанковіцкім і Віцебскім р-нах, левы прыток р. Лучоса (бас. р. Зах. Дзвіна). Даўж. 32 км. Пл. вадазбору 182 км^2. Выцякае з воз. Чарніца за 700 м на ПнЗ ад в. Латыгава Бешанковіцкага р-на, цячэ па Лучоскай нізіне, праз воз. Скрыдлева. Вусце каля в. Саўчонкі Віцебскага р-на. Даліна пераважна трапецападобная, у верхнім цячэнні невыразная. Пойма вузкая, чаргуецца па берагах, месцамі адсутнічае. Рэчышча звілістае, у сярэднім цячэнні на працягу каля 9 км каналізаванае.

ЧАРНО́БЫЛЬ, горад у Кіеўскай вобл. Украіны, на р. Прыпяць, пры яе ўпадзенні ў Кіеўскае вадасховішча.

У пісьмовых крыніцах упамінаецца з 1193. З 1362 у складзе ВКЛ. Пасля *Люблінскай уніі 1569* належаў Кароне (Польшча). Першапачаткова каралеўскі горад, потым уладанне Ф.*Кміты-Чарнабыльскага* (з 1566), Сапегаў, Хадкевічаў. Насельніцтва Ч. ўдзельнічала ў вызв. вайне ўкр. і бел. народаў 1648—54, казацка-сял. паўстанні 1702—04 пад кіраўніцтвам С.П.*Палія*, пасля чаго горад заняпаў. У выніку 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) далучаны да Рас. імперыі. З 1941 горад. У сувязі з аварыяй (крас. 1986) на *Чарнобыльскай АЭС* насельніцтва Ч. эвакуіравана (гл. *Чарнобыльская катастрофа 1986*).

ЧАРНО́БЫЛЬСКАЯ АЭС, першая атамная электрастанцыя на Украіне. Буд-ва пачалося ў 1971 каля г. *Чарнобыль* (адсюль назва), 1-ы і 2-і энергаблокі здадзены ў эксплуатацыю ў 1977. Мела 4 блокі на гетэрагенных водаграфітавых *ядзерных рэактарах* на цеплавых нейтронах тыпу РБМК агульнай магутнасцю 4000 МВт (1985). Пасля аварыі 1986 (гл. *Чарнобыльская катастрофа 1986*) эксплуатацыя і далейшае буд-ва станцыі спынена.

ЧАРНО́БЫЛЬСКАЯ КАТАСТРО́ФА 1986, адна з найбуйнейшых у свеце аварый на атамных электрастанцыях. Адбылася 26.4.1986 на Чарнобыльскай АЭС (ЧАЭС, Украіна, каля мяжы з Беларуссю) у ходзе праектных выпрабаванняў сістэм бяспекі. У выніку 2 магутных выбухаў разбураны рэактар 4-га энергаблока, рэактарны блок і машынная зала. Пры гэтым верхняя накрыўка рэактара масай каля 2000 т апынулася на верхняй частцы шахты рэактара пад вуглом 15° да вертыкалі. Распаленыя абломкі бетону і графіту выкідваліся вонкі праз адтуліны ў даху будынка, адначасова ў навакольнае асяроддзе выкідваліся радыенукліды. У выніку вакол суседняга рэактара (3-га блока) і турбінных блокаў узнікла каля 30 ачагоў пажару. З адкрытай актыўнай зоны рэактара і асабліва ў выніку пажару графітавай муроўкі на працягу 10 дзён у атмасферу выкідвалася вял. колькасць радыеактыўных рэчываў у выглядзе газаў, аэразоляў і макрачасціц. На працягу першых 10 сут выкінуты ў атмасферу матэрыял у выглядзе струменя мяняў свае напрамкі ў адпаведнасці з напрамкам ветру, шырока распаўсюджваўся над тэр. большай ч. Еўропы. Найб. інтэнсіўнымі былі яго выпадзенні над тэр. Беларусі, Украіны і Расіі. Выпадзенні мелі месца таксама ў большасці краін Еўропы, але ў цэлым там узроўні забруджвання былі малыя. Пэўная колькасць радыенуклідаў рассеялася па ўсім Паўн. паўшар'і, у невялікай колькасці яны зафіксаваны нават у Японіі і ЗША. Для ізаляцыі разбуранага рэактара і прадухілення паступлення радыеактыўнага матэрыялу ў навакольнае асяроддзе ў ліст. 1986 над 4-м энергаблокам узведзена ахоўнае збудаванне — аб'ект «Укрыццё» (саркафаг). Каля 70% радыеактыўных рэчываў, што ў выніку Ч.к. трапілі ў атмасферу еўрап. часткі б. СССР, выпала на тэр. Беларусі; 23% яе тэрыторыі (46,5 тыс. км^2) было забруджана цэзіем-137 больш за 37 кБк/м^2; на Украіне з такой жа шчыльнасцю забруджвання 28,5 тыс. км^2 — 4,8% яе тэрыторыі; у Расіі 35,2 тыс. км^2 — 0,5% яе тэрыторыі. На забруджанай тэр. Беларусі пражывала 2,2 млн. чал. (каля 20% насельніцтва). З больш як 18 тыс. км^2 сельгасугоддзяў (22%) з гасп. абарачэння з-за забруджвання выключана 2,64 тыс. км^2. У бел. сектары 30-кіламетровай зоны ад ЧАЭС створаны *Палескі радыяцыйна-экалагічны запаведнік*.



Схема энергаблока **Чарнобыльскай АЭС** з рэактарам: 1 — стрыжні кіравання; 2 — барабан-сепаратар; 3 — турбагенератар; 4 — бетонная ахова; 5 — паліўныя элементы; 6 — графітавы запавольнік; 7 — каналы.

Кіраўніцтва СССР і БССР доўгі час замоўчвала і ўтойвала ад грамадскасці памеры радыеактыўнага заражэння на тэр. Беларусі ў выніку Ч.к., што стварыла рэальную пагрозу жыццю і здароўю вял. колькасці насельніцтва. У сувязі з адсутнасцю пэўны час належных захадаў па ліквідацыі наступстваў Ч.к. ў шэрагу населеных пунктаў Гомельскай вобл. адбыліся мітынгі і забастоўкі (гл. *Гомельская забастоўка 1990*). Экалагічнае ўздзеянне Ч.к. паставіла б. СССР перад неабходнасцю вырашэння новых, выключна складаных і буйнамаштабных праблем, якія датычылі практычна ўсіх сфер грамадскага жыцця, многіх аспектаў навукі і вытв-сці, культуры і маралі. У ліп. 1989 Вярх. Савет БССР прызнаў усю тэр. Беларусі зонай экалагічнага бедства і, выкарыстоўваючы навук. патэнцыял вядучых устаноў і ведамстваў, прыняў Дзярж. праграму пераадолення наступстваў Ч.к. на 1990—95 і на перыяд да 2000, у 1991 — законы «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» і «Аб прававым рэжыме тэрыторый, якія падвергліся радыеактыўнаму забруджванню ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС», у 1998 — Закон «Аб радыяцыйнай бяспецы насельніцтва». З улікам глабальнага характару катастрофы, пагрозы яе вынікаў здароўю насельніцтва (у радыусе 30 км ад ЧАЭС) да 1.1.1987 з 188 нас. пунктаў эвакуіравана 115 174 чал., у т.л. на Беларусі 23,6 тыс., на Украіне 91,4 тыс., у Расіі 174 чал. За 15 гадоў пасля аварыі з зон забруджвання на Беларусі выселена больш за 135 тыс. чал., поўнасцю адселена 415 нас. пунктаў. Адсяленне жыхароў у асн. завершана. З больш як 5 тыс. чал., што пражывалі ў зоне наступнага адсялення, жаданне выехаць выказалі каля 2 тыс. Для перасяленцаў з 1986 пабудавана 64 836 кватэр, або 4519,4 тыс. м^2 жылля. Адначасова вырашалася задача ўзвядзення пасёлкаў, у іх пабудавана агульнаадук. школ на 44 072 месцы, дзіцячых дашкольных устаноў на 18 470 месцаў, амбулаторна-паліклінічных устаноў на 20 922 наведванні за змену, бальніц на 4160 ложкаў. З мэтай забеспячэння чыстым палівам насельніцтва забруджаных радыенуклідамі раёнаў пракладзена больш за 1898 км сетак газаправодаў, пабудавана 1847 км сетак водазабеспячэння, праведзена добраўпарадкаванне нас. пунктаў, жывёлагадоўчых ферм, механізаваных двароў і інш. аб'ектаў.

Ва ўсёй зоне забруджвання назіраецца рост сардэчна-сасудзістых, страўнікава-кішэчных, нервова-псіхічных захворванняў, хвароб апорна-рухальнага апарату і органаў дыхання. Растуць захворванні на рак шчытападобнай залозы ў дзяцей (у 1966—85 іх было 21). Менавіта рак шчытападобнай залозы разглядаецца як непасрэдны вынік Ч.к. З 1993 вядзецца Бел. дзярж. рэгістр асоб, якія падвергліся ўздзеянню радыяцыі з прычыны катастрофы на ЧАЭС. У яго занесены даныя пра больш як 250 тыс. чал.

На пач. 2001 на Беларусі налічвалася 9985 інвалідаў, у якіх устаноўлена прычынная сувязь захворванняў з вынікамі Ч.к., з іх 1835 дзяцей і падлеткаў. Штогод міжведамаснымі саветамі па ўстанаўленні прычыннай сувязі захворванняў з вынікамі катастрофы на ЧАЭС разглядаецца каля 3 тыс. спраў. Паглыбленае мед. абследаванне кожны год праходзяць больш за 1 млн. чал. Намаганнямі органаў дзярж. кіравання, грамадскіх чарнобыльскіх арг-цый, вучоных і спецыялістаў шэраг праблем удалося вырашыць. Створана заканадаўчая і нарматыўна-прававая база практычна па ўсіх кірунках дзейнасці па пераадоленні вынікаў Ч.к. Да 1991 выдаткі, звязаныя з пераадоленнем наступстваў Ч.к., нёс урад СССР; пасля распаду СССР увесь цяжар фін. выдаткаў лёг на Беларусь. Паводле падлікаў сумарныя страты на Беларусі ад Ч.к. ў 1986—2015 складуць каля 235 млрд. дол. ЗША (у цэнах на 1.6.1992 — амаль 32 бюджэты рэспублікі за 1985). У бюджэце Беларусі расходы на чарнобыльскую праграму складаюць значную частку. Прынята Дзярж. праграма па пераадоленні вынікаў катастрофы на ЧАЭС на 2001—05 і на перыяд да 2010. Паводле рашэння ўрада Украіны Чарнобыльская АЭС афіцыйна закрыта 15.12.2000. Аднак вырашэнне чарнобыльскіх наступстваў для жыхароў Беларусі яшчэ доўгі-доўгі час будзе складанай і балючай праблемай.

Літ.: Чарнобыль: Погляд праз дзесяцігоддзе: [Давед.]. Мн., 1996. *В.З.Протчанка.*

«ЧАРНО́БЫЛЬСКІ ШЛЯХ», грамадскія акцыі па ўшанаванні памяці ахвяр *Чарнобыльскай катастрофы 1986.* Упершыню праведзена 30.9.1989 у Мінску па ініцыятыве прадстаўнікоў *Беларускага народнага фронту «Адраджэнне»*, дэпутатаў Вярх. Савета Беларусі, вучоных з мэтай прыцягнуць увагу грамадскасці да праблемы пераадолення вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. У рамках акцыі адбылося несанкцыяніраванае шэсце і мітынг (удзельнічала больш за 20 тыс. чал.). Яго ўдзельнікі прынялі «Ухвалу» з заклікам да ўлад распрацаваць рэальную праграму выратавання ахвяр аварыі, прыцягнуць да адказнасці кіраўнікоў рэспублікі, якія стварылі атмасферу сакрэтнасці вакол вынікаў трагедыі, садзейнічаць развіццю дэмакратыі ў БССР. Працягам гэтай акцыі стала Асамблея «Ч.ш.» (25—26.11.1989), якая прыняла «Дэкларацыю аб неабходнасці прыняцця тэрміновых мер па пераадоленні вынікаў аварыі на ЧАЭС», «Зварот да II з'езда народных дэпутатаў СССР» і «Зварот да народаў свету» з просьбай аб дапамозе. У час «Ч.ш.» 26.4.1991 з нагоды 5-й гадавіны аварыі ў Мінскім кафедральным саборы адбылося набажэнства, на пл. Бангалор устаноўлены мемарыяльны знак «Ахвярам Чарнобыля». Найб. грамадскі рэзананс меў «Ч.ш.» 26.4.1996 з нагоды 10-й гадавіны трагедыі (удзельнічала больш за 50 тыс. чал.). Акцыя суправаджалася супрацьстаяннем паміж яе ўдзельнікамі і сіламі аховы парадку. З 1996 «Ч.ш.» праводзіцца штогод 26 крас. ў Мінску і шэрагу інш. гарадоў Беларусі.

Н.С.Гардзіенка.

ЧАРНО́ВА, возера ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Чарнаўка (выцякае з возера), за 13 км на ПнЗ ад г. Гарадок, каля в. Лыска. Пл. 3,18 км^2, даўж. 5,72 км, найб. шыр. 920 м, найб. глыб. 19,3 м, даўж. берагавой лініі 17,8



км. Пл. вадазбору 22,5 км^2. Катлавіна лагчыннага тыпу, выцягнутая з ПнЗ на ПдУ. Схілы катлавіны выш. 6—10 м (на Пн 12—16 м), пад хмызняком, на ПдЗ забалочаныя і аблесеныя. Берагі высокія, пясчаныя, параслі хмызняком, на Пн месцамі абразійныя. На ПнЗ пойма шыр. да 100 м. Дно карытападобнае, глыбокія ўпадзіны чаргуюцца з мелямі. Амаль усё дно ўкрыта ілам, на водмелях уздоўж берагоў і каля астравоў пясчанае, месцамі зайленае. 5 невял. астравоў агульнай пл. 0,6 га. Шыр. паласы надводнай расліннасці да 150 м. Упадаюць 5 ручаёў.

Возера **Чарнова**.

ЧАРНО́Ў Віктар Міхайлавіч (1.12.1873, г. Камышын, цяпер Валгаградскай вобл., Расія — 15.4.1952), расійскі паліт. і дзярж. дзеяч. Вучыўся ў Маскоўскім ун-це (1892—94). З канца 1880-х г. у рэв. руху. У 1894 арыштаваны па справе *«Народнага права»* і сасланы ў Тамбоўскую губ. З 1899 у эміграцыі. Адзін з заснавальнікаў (1901—02) партыі *сацыялістаў-рэвалюцыянераў*, чл. яе ЦК і гал. тэарэтык (спалучаў ідэі народніцкага сацыялізму і *махізму*). У 1-ю сусв. вайну выступаў з антываен. пазіцый, удзельнік *Цымервальдскай канферэнцыі 1915* і *Кінтальскай канферэнцыі 1916*. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 вярнуўся ў Расію, у маі—вер. 1917 міністр земляробства ў *Часовым урадзе*. Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 змагаўся супраць улады бальшавікоў. 4—11(17—24).11.1917 знаходзіўся ў Магілёве ў *Стаўцы Вярхоўнага галоўнакамандуючага*, дзе вёў перагаворы з Б.В.Савінкавым, А.Р.Гоцам, М.Дз.Аўксенцьевым і інш. аб стварэнні на чале з сабою «агульнасацыялістычнага ўрада», які б адхіліў ад улады ўрад У.І.Леніна. Зняцце ген. М.М.Духоніна з пасады вярхоўнага галоўнакамандуючага сарвала планы Ч. 18.1.1918 Ч. абраны старшынёй *Устаноўчага сходу*, пазней чл. *Камітэта членаў Устаноўчага сходу*. З 1920 зноў у эміграцыі. У 1927 стварыў «Лігу народаў новага Усходу». Лічыў, што СССР у будучым распадзецца на шэраг суверэнных дзяржаў. У 2-ю сусв. вайну ўдзельнік *руху Супраціўлення* ў Францыі, потым жыў у ЗША. Аўтар мемуараў і шэрагу тэарэт. прац.

Тв.: Перед бурей. М., 1993. *Э.А.Ліпецкі.*

ЧАРНО́Ў Дзмітрый Канстанцінавіч (1.11.1839, С.-Пецярбург — 2.1.1921), расійскі вучоны ў галіне металургіі; заснавальнік металазнаўства і тэорыі тэрмічнай апрацоўкі сталі. Скончыў Пецярбургскі практычны тэхнал. ін-т (1858), дзе выкладаў у 1859—66. У 1866—80 інжынер Абухаўскага сталеліцейнага з-да, з 1889 праф. Міхайлаўскай артыл. акадэміі ў С.-Пецярбургу. Устанавіў залежнасць структуры і ўласцівасцей сталі ад яе гарачай мех. і тэрмічнай апрацоўкі, адкрыў крытычныя т-ры, пры якіх адбываюцца змены фазавага стану і

Дз.К.**Чарноў**.

К.П.**Чарноў**.

структуры сталі пры яе награванні і ахаладжэнні ў цвёрдым выглядзе (так званыя пункты Ч.). Распрацаваў тэорыю крышталізацыі стальнога злітка, удасканаліў канвертарны працэс. Аўтар курса «Сталеліцейная справа» (1892).

Літ.: Гумилевский Л. Чернов. М., 1975.

ЧАРНО́Ў Кірыла Пракопавіч (8.6.1907, в. Амяленская Слабада Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл. — 28.10.1972), Герой Сав. Саюза (1943), ген.-маёр артылерыі (1953). Скончыў Аб'яднаную бел. вайск. школу (1933), Вышэйшую афіцэрскую артыл. школу (1944), Вышэйшыя акад. артыл. курсы (1946). У Чырв. Арміі з 1929. У Вял. Айч. вайну са жн. 1941 на Паўд.-Зах., Сталінградскім, 1-м і 3-м Укр. франтах: камандзір процітанк. артыл. палка, брыгады. Артыл. брыгада на чале з палк. Ч. вызначылася ў вер. 1943 на тэр. Канеўскага р-на (Украіна) пры фарсіраванні Дняпра і ў баях на плацдарме. Да 1961 у Сав. Арміі.

ЧАРНО́ЎСКАЯ Марыя, бел. фалькларыстка і этнограф пач. 19 ст. Жыла ў Вільні. Запісвала бел. песні і абрады ў в. Губеншчына (цяпер Крычаўскі р-н Магілёўскай вобл.). Аўтар арт. «Элементы славянскай міфалогіі, што захаваліся ў звычаях вясковага ладу на Белай Русі» (1817); у перакладзе на рус. мову ён друкаваўся ў «Вестнике Европы» (1818) і «Северном архиве» (1822). Упершыню дала ў арыгінальным вымаўленні бел. нар. песні з нотамі і навук. каментарыем, апісала Купалле, Радаўніцу і інш. святы, вобразы нар. міфалогіі, стравы, адзенне, сял. побыт беларусаў. Звярнула ўвагу на самабытнасць духоўнай культуры бел. народа. *Г.А.Каханоўскі.*

ЧАРНО́ЎСКІ Казімір Гаўрылавіч (1791, в. Карытніца Вілейскага р-на Мінскай вобл.— 8.11.1847), адзін з вынаходнікаў падводнага карабля. З дваран. З 1824 у С.-Пецярбургу вучыўся ў медыка-хірургічнай акадэміі. Двойчы зняволены за прыналежнасць да рэв. т-ва (1829) і падрыхтоўку паўстання (1839). Памёр у ссылцы ў г. Сарапул (Удмурція). У 1825—29 распрацаваў праект падводнага карабля. Прапанаваў будаваць карабель цыліндрычнай формы з метал. корпусам і рухомым перыскопам. Ідэю Ч. ажыццявіў рас. ген. К.А.*Шыльдэр*, які першы пабудаваў метал. падводную лодку (1834). Макет падводнага карабля Ч. экспануецца ў Дзярж. музеі Беларусі.

Літ.: Быховский И.А. Рассказы о русских кораблестроителях. Л., 1966.

ЧАРНО́ЦКАЕ ВО́ЗЕРА. У Петрыкаўскім р-не Гомельскай вобл., у пойме р. Прыпяць, за 1,5 км на ПнЗ ад в. Чарноцкае, за 5 км на ПдУ ад г. Петрыкаў. Пл. 0,3 км^2, даўж. 2,9 км, найб. шыр. 100 м, даўж. берагавой лініі 6 км. Катлавіна старычнага тыпу, серпападобнай формы. Берагі высокія, пясчаныя, на У абразійныя, пад хмызняком.

ЧАРНО́ЦКІ Напалеон Казіміравіч (13.7.1866, в. Нача Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл. — 14.2.1937), бел. публіцыст, перакладчык. Скончыў Слуцкую гімназію (1887), Маскоўскі ун-т (1894). У Слуцкай гімназіі ўваходзіў у тайны гурток самаадукацыі, у Маскве — у тайныя студэнцкія гурткі сацыяліст. накіраванасці. За ўдзел у хваляваннях 1890 выключаны з ун-та і сасланы ў маёнтак бацькі пад нагляд паліцыі. Працаваў урачом. У 1904—05 мабілізаваны на Маньчжурскі фронт. У 1908—12 у эміграцыі ў Канадзе. З 1918 у Варшаве, пасля ў Вільні. У 1922 уступіў у Польскую сацыяліст. партыю. З 1928 працаваў лекарам на Валыні, з 1931 у г. Ліда Гродзенскай вобл. З 1936 жыў у в. Вял. Лябёдка Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл. Першая літ. праца — удзел у перакладзе і выданні на гектографе 1-га варыянта рэв. брашуры *«Дзядзька Антон»* (1885, не выяўлена); браў удзел у выданні 2-га варыянта (1892; з М.Абрамовічам). Пераклаў на польскую мову апавяданне У.Караленкі «У дрэннай кампаніі» (каля 1887, не выяўлена, захаваліся 2 лісты Ч. да пісьменніка), на бел. мову п'есы «Сватанне» А.Чэхава і «Пашыліся ў дурні» М.Краліўніцкага (1910). У арт. «Да пытання пра беларускую народную школу» (1908) выступіў у абарону бел. мовы, з прыязнасцю пісаў пра творчасць Я.Коласа, паказаў добрае веданне бел. фальклору. Аўтар брашуры «Як будзе з зямлёю?» (1907), успамінаў пра рэв. рух, Абрамовіча, публіцыстычных арт. у «Нашай ніве» і «Вольнай Беларусі».

Тв.: Батлейкі з ваколіц Начы // Народны тэатр. Мн., 1983.

Літ.: Александровіч С. Пуцявіны роднага слова. Мн., 1971; Скалабан В. Працяг гісторыі з «Дзядзькам Антонам» // Полымя. 1988. № 2; Каханоўскі Г. Таямніцы за чортавым мостам // Маладосць. 1992. № 5. *В.У.Скалабан.*

ЧАРНУ́ЙКА, Чарнушка, рака ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., левы прыток р. Обаль (бас. р. Зах. Дзвіна). Даўж. 23 км. Пл. вадазбору 97 км². Пачынаецца за 500 м на ПнЗ ад в. Першамайка, вусце за 700 м на У ад в. Воўкава. Цячэ ў межах Гарадоцкага ўзвышша.

ЧАРНУ́ШКА (Nigella), род кветкавых раслін сям. казяльцовых. Каля 25 відаў. Пашыраны ў Міжземнамор'і і Пярэдняй Азіі. На Беларусі 1 від — Ч. палявая (N. arvensis); заносная, зрэдку трапляецца ў зах. і паўд. раёнах. Як дэкар. расліна культывуецца Ч. дамаская (N. damascena), як прыпраўная — Ч. пасяўная (N. sativa).

Аднагадовыя травяністыя расліны выш. да 40 см. Сцябло простае або галінастае. Лісце вузкае, перыста- ці пальчата-рассечанае. Кветкі адзіночныя, жоўтыя ці блакітныя. Плод — шматлістоўка. Вострапрыпраўныя, меданосныя і дэкар. расліны.

Чарнушка палявая.

ЧАРНУ́ШКІ (Erebia), род матылёў сям. аксамітніц атр. лускакрылых, або дзённых матылёў. Каля 45 відаў. Пашыраны ў Еўразіі. На Беларусі рэдка трапляюцца Ч.: эфіопка (E. aethiops; занесена ў Чырв. кнігу), кафейная (E. ligea), медуза (E. medusa). Матылі жывуць на раслінах, вусені кормяцца на злаках.

Размах крылаў 35—50 мм. Крылы шырокія, аксаміцістыя, цёмна-карычневыя. Уздоўж вонкавага краю крылаў размешчаны шэраг вочак — круглых чорных плям з белымі «зрэнкамі» ў цэнтры. Вочкі аблямаваны светлым рыжаватым полем рознай шырыні.



1 2

Чарнушкі: 1 — кафейная; 2 — эфіопка.

Адно пакаленне за год. Іл. гл. таксама да арт. *Аксамітніцы.*

ЧАРНУШЭ́ВІЧ Аляксандр Анікеевіч (1899, г. Капыль Мінскай вобл. — 29.10.1937), партыйны і дзярж. дзеяч БССР. Удзельнік партыз. руху на Беларусі ў грамадз. вайну, потым барацьбы з бандытызмам. З 1922 на парт. рабоце: сакратар Грэскага райкома КП(б)Б, заг. аддзелаў Бабруйскага і Віцебскага акр. к-таў партыі, культуры і прапаганды ЦК КП(б)Б. З кастр. 1932 сакратар Мінскага гаркома КП(б)Б. З сак. 1933 да лют. 1936 нарком асветы БССР, потым заг. аддзела Бел. геал. разведкі. Чл. ЦК КП(б)Б у 1929—36, чл. Бюро ЦК КП(б)Б у 1931—34, канд. у чл. Бюро ЦК КП(б)Б у 1935—36. Чл. ЦВК БССР у 1931—36, чл. Прэзідыума ЦВК БССР у 1933—36. 19.6.1937 арыштаваны органамі НКУС БССР і 28.10.1937 Ваен. калегіяй Вярх. суда СССР засуджаны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1956. *Я.С.Фалей.*

ЧАРНУШЭ́ВІЧ Арнольд Пятровіч (15.1.1933, Мінск — 2.9.1991), бел. спартсмен і трэнер (фехтаванне на шаблях). Майстар спорту СССР (1956), засл. трэнер Беларусі (1966). Скончыў Бел. ін-т фіз. культуры (1957). З 1967 трэнер Рэсп. школы вышэйшага спарт. майстэрства. Бронз. прызёр XVII Алімп. гульняў у камандным першынстве (1960, Рым), чэмпіянату свету ў асабістым першынстве (1958, г. Філадэльфія, ЗША). Чэмпіён свету (1961, г. Турын, Італія), сярэбраны (1959, Будапешт) і бронз. (1962, Буэнас-Айрэс) прызёр чэмпіянатаў свету ў камандным першынстве. Чэмпіён Спартакіяды народаў СССР у асабістым першынстве (1959), СССР у асабістым (1962) і камандным (1958, 1962, 1964, 1966) пяршынствах. Сярод выхаванцаў чэмпіён Спартакіяды народаў СССР У.Расолька.

ЧАРНУШЭ́ВІЧ Дзмітрый Сільч (13.11.1882, г. Капыль Мінскай вобл. — 28.6.1938), дзяржаўны дзеяч Беларусі. З 1901 працаваў у канцылярыях станавых прыставаў у Брагіне, Капылі, в. Юравічы Рэчыцкага пав. У 1904—06 у Амерыцы, у 1906—07 і ў 1914—17 у арміі. Са студз. 1918 сакратар Слуцкага пав. аб'яднання кааператываў. За прапаганду сярод ням. салдат у сак.—маі 1918 зняволены ў канцлагер. З вер. 1918 рэдактар, пам. загадчыка, заг. аддзела Белнацкома. Са студз. 1919 камісар сац. забеспячэння ў Часовым рэв. рабоча-сял. урадзе БССР. З сак. 1919 чл. калегіі Наркамата сац. забеспячэння Літ.-Бел. ССР, з мая старшыня Капыльскага і Клецкага вал. выканкомаў. З вер. 1919 сакратар пав. выканкома, адначасова сакратар рэўкома, старшыня пав. к-та партыі, заг. зямельнага аддзела г. Духаўшчына Смаленскай губ. З лют. 1922 старшыня Ігуменскага пав. выканкома, з вер. 1923 сакратар Ігуменскага пав. к-та партыі. З сак. 1924 нарком унутр. спраў БССР, са жн. 1924 сакратар ЦВК БССР, са жн. 1927 старшыня Упраўлення дзярж. страхавання БССР. З пач. 1930-х г. нам. дырэктара Ін-та л-ры, мастацтва і мовы Бел. АН, пазней у Мінскім аддз. Бел. канторы Усесаюзнага акц. т-ва па забеспячэнні сельскай гаспадаркі сродкамі вытворчасці. Чл. ЦВК БССР у 1919, 1921—31, чл. Прэзідыума ЦВК 1924—27. Чл. ЦВК Літ.-Бел. ССР (1919). Канд. у чл. Кантрольнай камісіі КП(б)Б у 1923—24, чл. Рэвізійнай камісіі КП(б)Б у 1925—27, чл. ЦК КП(б)Б у 1929—30. 25.1.1938 арыштаваны і неабгрунтавана асуджаны Ваен. калегіяй Вярх. суда СССР да вышэйшай меры пакарання, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1958. *Я.С.Фалей.*

ЧАРНУШЭ́ВІЧ Нічыпар Тодаравіч (14.11.1900, г. Капыль Мінскай вобл. — 18.2.1967), бел. паэт. Брат М.*Хведаровіча*. Скончыў БДУ (1928). У 1917—20 настаўнічаў. У 1924—29 працаваў у газ. «Савецкая Беларусь». У 1930 рэпрэсіраваны, у 1931 сасланы на 5 гадоў у г. Вятка, працаваў у газ. «Вятская правда». У 1935 абвінавачанні зняты, рэабілітаваны ў 1960. З 1935 настаўнічаў у Маскве, з 1941 працаваў у Цюмені ў газ. «Тюменская правда». З 1947 у Мінску,

Н.Т.**Чарнушэвіч**.

працаваў у Дзярж. выд-ве Беларусі, на Бел. тэлебачанні і інш. Друкаваўся з 1923. Чл. літаб'яднання «Маладняк». У кнігах паэзіі «Дзіва» (1927), «Нясу надзею» (1962), «Гаворка дум» (1966) роздум над месцам чалавека на зямлі, тэма прыроды. Аўтар п'ес, кінааповесці. Перакладаў на бел. мову творы рус., укр. і інш. паэтаў.

Тв.: Выбр. вершы. Мн., 1975. *І.П.Чыгрын.*

ЧАРНЫ́Ш (Tringa ochropus), птушка сям. бакасавых атр. сеўцападобных. Пашыраны ў лясной зоне Еўразіі, у т.л. на Беларусі. Нар. назвы бакас, целягуз.

Даўж. да 26 см, маса да 90 г. Апярэнне спі-

ны, шыі і галавы буравата-чорнае, з невял. белымі стракацінамі. На галаве белыя палосы. Надхвосце белае, пярэдняя ч. шыі, валяк, грудзі і бакі белыя з бураватымі падоўжанымі стракацінамі. Дзюба доўгая, чорная. Нясе 2—4 яйцы. Корміцца воднымі і наземнымі насякомымі, малюскамі, чарвямі.

Э.Р.Самусенка.

Чарныш.

ЧАРНЫ́Ш Аляксандр Іванавіч (12.2.1917, в. Кромкавічы Докшыцкага р-на Віцебскай вобл. — 29.6.1944), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў Мар'інагорскі с.-г. тэхнікум (1935), курсы тэхнікаў ППА (1939), удасканалення афіцэрскага саставу (1943). Удзельнік сав.-фінл. вайны 1939—40. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Ленінградскім, Закаўказскім, Бел. і 1-м Бел. франтах. Стралк. рота на чале з капітанам Ч. вызначылася ў баях 28—29.6.1944 каля г.п. Кіраўск: адбіла 14 контратак танкаў і пяхоты праціўніка, блакіравала шашу Бабруйск—Мінск і перарэзала шлях адступлення ворагу. Загінуў у гэтым баі. У г. Докшыцы і ў в. Бярозкі Докшыцкага р-на яму пастаўлены помнікі.

ЧАРНЫ́Ш Леангард Пятровіч (н. 28.4.1930, с. Туран Тункінскага р-на, Бурацыя), бел. вучоны-эканамі́ст. Д-р эканам. н. (1986), праф. (1989). Скончыў Маскоўскі фін. ін-т (1953). Працаваў у Мін-ве фінансаў СССР (1953—56). З 1957 у Ін-це эканомікі АН Беларусі. З 1960 у Дзяржплане Беларусі, заг. аддзела н.-д. эканам. ін-та Дзяржплана Беларусі. З 1987 у Мінскай вышэйшай парт. школе, Акадэміі кіравання пры СМ БССР. З 1992 прарэктар Ін-та кіравання і прадпрымальніцтва. З 1998 у БДУ (у 1998—99 заг. кафедры). Навук. працы па праблемах арганізацыі, планавання і кіравання вытв-сцю, рыначнай эканомікі, гісторыі эканам. думкі на Беларусі.

Тв.: Вопросы моделирования потребительского спроса. Мн., 1969; Категории планирования народного хозяйства. Мн., 1981; Становление планирования народного хозяйства Белорусской ССР. Мн., 1982; Экономика Беларуси. Мн., 1999; Рынок ценных бумаг. Кн. 1—2. Мн., 1998 (у сааўт.); Основы общей теории управления. Мн., 2001.

ЧАРНЫШО́ВА ТЭА́ТРЫ, 1) бел. тэатральная трупа ў 18 — 1-й пал. 19 ст. Існавала ў рэзідэнцыі графа З.Р.Чарнышова ў г. Чачэрск Гомельскай вобл. да 1802, аркестр да 1828. Складалася з прыгонных спевакоў, хору, аркестра, мела спец. тэатр. памяшканне. Часам у спектаклях разам з прыгоннымі акцёрамі выступалі аматары-дваране (опера «Новая сям'я» Фрэйліха на лібрэта С.Вязміцінава, 1787). 2) Тэатральны будынак (арх. Брыгонзі) у г. Магілёў, узведзены паводле загаду Чарнышова ў 1780 каля ген.-губернатарскага палаца на Гандлёвай плошчы. Паказы ў тэатры пачалі італьян. опера («Фальшывы астраном», «Фраскатанка», «Апошняя палюбоўніца» Дж.Паізіела) і прыдворная капэла з Пецярбурга. Прыгонны аркестр Чарнышова (паводле складу малы сімфанічны) суправаджаў спектаклі, іграў на балях, прыдворных святах. Паводле некат. звестак, у 1789 была паказана камедыя Буасі «Французы ў Лондане».

ЧАРНЫШО́Ў Аляксандр Аляксеевіч (21.8.1882, с. Ловень Рэпкінскага р-на Чарнігаўскай вобл., Украіна — 18.4.1940), савецкі вучоны ў галіне электратэхнікі. Акад. АН СССР (1932, чл.-кар. 1929). Скончыў Пецярбургскі політэхн. ін-т (1907), дзе і выкладаў (да 1936, з 1919 праф.). Адначасова з 1918 у Фіз.-тэхн. ін-це і інш. установах АН СССР. Навук. працы па тэхніцы высокіх напружанняў і радыётэхніцы. Даследаваў праблемы эл. вымярэнняў, тэлебачання, далёкасці радыётэлефоннай сувязі, электрыфікацыі чыгункі, планавання і арганізацыі навук. работ. Удзельнічаў у распрацоўцы плана ГОЭЛРО. Прэмія імя Леніна 1930.

ЧАРНЫШО́Ў Валерый Алегавіч (н. 10.1.1935, г. Таганрог, Расія), бел. вучоны ў галіне інфарм. тэхналогій. Д-р тэхн. н. (1975), праф. (1985). Скончыў Таганрогскі радыётэхн. ін-т (1957). З 1975 у Мінскім радыётэхн. ін-це (заг. кафедры, прарэктар), у 1983—93 у Мінскім ін-це культуры (заг. кафедры). Навук. працы па тэхн. кібернетыцы, АСК і выліч. сетках. Распрацаваў тэарэт.-метадалагічныя і інструментальна-вытв. асновы пабудовы інфарм. сістэм.

Тв.: АСУ ТП в промышленном животноводстве. М., 1984; Основы системотехники. Томск, 1992 (у сааўт.); Основы информатизации субъектов хозяйствования на базе новых информационных технологий. Мн., 2003 (у сааўт.).

М.П.Савік.

ЧАРНЫШО́Ў Васіль Яўхімавіч (26.8.1908, с. Краснае Арлоўскай вобл., Расія — 12.11.1969), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыят. падполля і партыз. руху на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, ген.-маёр (1943), Герой Сав. Саюза (1944), сав. парт. і дзярж. дзеяч. Скончыў Арлоўскае ваен. пях. вучылішча (1927), Бранскі камуніст. ун-т (1930). У 1930-я г. 1-ы сакратар Жлобінскага, Васілішкаўскага райкомаў, Баранавіцкага абкома КП(б)Б. У Вял. Айч. вайну з 1942 упаўнаважаны ЦК КП(б)Б і ЦШПР па Баранавіцкай вобл., з сак. 1943 сакратар Баранавіцкага падп. абкома КП(б)Б, адначасова камандзір Баранавіцкага партыз. злучэння Паўн. зоны. Пасля вайны 1-ы сакратар Брэсцкага, Мінскага абкомаў КП(б)Б, у 1950 сакратар ЦК КП(б)Б. З 1951 1-ы сакратар Калінінградскага абкома, з 1959 — Прыморскага крайкома КПСС. З 1969 нам. старшыні парт. кантролю пры ЦК КПСС. Чл. ЦК КП(б)Б у 1949—52, чл. Бюро ЦК КП(б)Б у 1949—51, ЦК КПСС з 1952. Дэп. Вярх. Савета СССР з 1950.

ЧАРНЫШО́Ў Віктар Паўлавіч (н. 17.7.1919, г. Луганск, Украіна), бел. архітэктар. Засл. будаўнік Беларусі (1965). Скончыў Харкаўскі ін-т інжынераў камунальнага буд-ва (1941). З 1946 гал. архітэктар г. Орша (Віцебская вобл.), з 1948 — Гомеля, у 1967—70 — Мінска. З 1956 нач. Віцебскага абл. філіяла, з 1966 гал. архітэктар ін-та «Белдзяржпраект», з 1970 дырэктар Мінскага філіяла Цэнтр. н.-д. і праектнага ін-та горадабудаўніцтва, з 1975 нам. дырэктара БелНДІдзіпрасельбуда, у 1989—96 у Дзярж. пазаведамаснай экспертызе праектаў і каштарысаў Мінгарвыканкома. Асн. работы: праекты забудовы кварталаў па вуліцах Савецкай, Сялянскай, Першамайскай у Гомелі (1949—50), вул. Фрунзе ў Віцебску (1957), планіроўка пл. Леніна ў Оршы (1962), генпланы Віцебска (1966), Наваполацка Віцебскай вобл. (1960, 1973, усе ў аўтарскім калектыве). Прадстаўляў Беларусь у еўрап. Камісіі ААН (1963—73, Жэнева). Дзярж. прэмія Беларусі 1984.

ЧАРНЫШО́Ў Уладзімір Фёдаравіч (н. 15.12.1939, с. Чардым Лапацінскага р-на Пензенскай вобл., Расія), бел. мастак тэатра і кіно. Скончыў Усесаюзны ін-т кінематаграфіі ў Маскве (1968). З 1969 працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм», у 1995—2001 гал. мастак Нац. акад. драм. т-ра імя М.Горкага. З 1996 выкладае ў Бел. ун-це культуры, з 1997

У.**Чарнышоў**. Святы дуб. 1988.

у Бел. АМ. Мастак-пастаноўшчык тэлевізійных маст. фільмаў «Чырвоны агітатар Трафім Глушкоў», «Бераг прынцэсы Люські» (абодва 1969), «Спяшайся будаваць дом» (1970), «Побач з камісарам» (1978), «Купалава ноч», «Зацюканы апостал» (абодва 1982), «Астравы на далёкіх азёрах» (1984), «Халады ў пачатку вясны» (1985), «Выклік» (1986), «Пушча» (1988), «Свечка» (1990), «Інтэрпол» (1991); маст. кінафільмаў «Вялікі трамплін» (1974), «Сямейныя абставіны» (1977), «Дачка камандзіра» (1981, з У.Белавусавым), «Запіскі юнага ўрача» (1991) і інш. Афарміў спектаклі ў т-ры імя М.Горкага: «У прыцемках» А.Дударава (1996), «Браты Моар» Ф.Шылера, «Раскіданае гняздо» Я.Купалы, «На залатым возеры» Э.Томпсана (усе 1997), «Перпетуум мобіле, альбо Вечар яўрэйскага анекдота» Б.Луцэнкі (1998), «Калігула» А.Камю (2002). Сярод жывапісных работ «Двор. Вільня» (1966), «На цімкавіцкай мяжы» (1981), «Святы дуб» (1988). Аўтар партрэтаў, графічнай серыі «Па святых месцах» (1991) і інш. Творы вылучаюцца эмацыянальнасцю, рытмічнасцю кампазіцыйнай пабудовы, колеравай насычанасцю, глыбінёй прастораваго асяроддзя. *Л.Ф.Салавей.*

ЧАРНЫШЭ́ВІЧ Аркадзь Дзмітрыевіч (8.8.1912, в. Кулакі Салігорскага р-на Мінскай вобл. — 18.1.1967), бел. пісьменнік. Скончыў Кудымкарскае пед. вучылішча (1940). З 1930 настаўнік у Пермскай вобл., у 1950—57 дырэктар Насовіцкай і Свірскай школ у Мядзельскім р-не Мінскай вобл. Друкаваўся з 1926. Аўтар зб-каў апавяданняў «Суседзі» (1956), «Марцін Когут» (1958), «Праз зімы і вёсны» (1960), «Новы дом» (1967), у якіх псіхалагічна тонка даследуе жыццё чалавека, раскрывае багацце і разнастайнасць яго эмацыянальнага свету. Раман «Світанне» (1955) пра палескую вёску першых паслякастр. гадоў, раман-хроніка «Засценак Малінаўка» (кн. 1—2, 1961—64) пра бел. вёску напярэдадні рэвалюцыі 1905—07. Творчасці Ч. ўласцівы дакладнае веданне вясковага побыту, сял. псіхалогіі, грунтоўная распрацаванасць вобразаў і малюнкаў бел. прыроды, аналітызм, багатая мова. Пісаў для дзяцей: цыкл апавяд. «Лета» (1940), аповесці «У адной сям'і» (1951), «На сажалках» (1954), зб. апавяд. «Зосін лужок» (1952), «Апавяданні старога Арцёма» (1958).

Тв.: Выбр. тв. Т. 1—2. Мн., 1979; Аўтабіяграфія // Пяцьдзесят чатыры дарогі. Мн., 1963.

Літ.: Бугаёў Дз. Шматграннасць. Мн., 1970; Куляшоў Ф. Шлях да майстэрства // Полымя. 1972. № 8; Шыловіч А. Жаданая сустрэча // Там жа. 1980. № 7.

А.М.Шыловіч.

ЧАРНЫШЭ́ВІЧ Хведар Іосіфавіч (пач. 1880-х г., г. Капыль Мінскай вобл. — ?), бел. паэт. Вандраваў у пошуках работы па Случчыне, займаўся кравецтвам, з 1916 працаваў на заводзе ў Петраградзе. З 1919 жыў каля Нясвіжа (Мінская вобл.). Друкаваўся з 1908 у газ. «Наша ніва», «Беларуская думка», «Родная страха», час. «Голос низа», «Вольная думка» і інш. Асн. матывы лірыкі — любоў да Бацькаўшчыны, яе людзей, прыроды, вера ў лепшае жыццё (вершы «Лета», «Самагудка», «Сонца ўстае», «Зорка», «Вечар», «Веснавая мелодыя», «Бурная ноч», «Мора»). Заклікаў бел. народ да свядомага грамадскага жыцця («Прачынайся, мой край», «Жыве Беларусь», «Пагудка», «Песня кавала»). Аўтар паэмы «Нявольнік» (1918). На бел. мову пераклаў паэму Т.Шаўчэнкі «Кацярына» (1911, пад рэд. Я.Купалы). Частка яго рукапісаў, у т.л. паэма «Навабранец», зберагаецца ў б-цы АН Літвы.

Тв.: У кн.: Беларуская дакастрычніцкая паэзія. Мн., 1967.

Літ.: Клейнборт Л.М. Молодая Белоруссия. Мн., 1928; Каханоўскі Г. «...І іншыя» // Каханоўскі Г. Адчыніся, таямніца часу. Мн., 1984. *А.С.Ліс.*

ЧАРНЫШЭ́НКА Іосіф Дзмітрыевіч (26.9.1924, с. Кавалёўка Кіеўскай вобл. — 28.2.1995), бел. вучоны ў галіне педагогікі. Д-р пед. н. (1978), праф. (1978). Засл. работнік вышэйшай школы Беларусі (1984). Скончыў віцебскія настаўніцкі (1950) і пед. (1953) ін-ты. Настаўнічаў, быў дырэктарам сярэдняй школы ў Віцебску. З 1966 у Віцебскім пед. ін-це (у 1969—74 і 1978—82 заг. кафедры), адначасова з 1982 заг. лабараторыі НДІ прац. навучання і прафес. арыентацыі АПН СССР. Навук. працы па праблемах маральнага, патрыят. і прац. выхавання школьнікаў, методыкі і практыкі навучання.

Тв.: Общественно полезный труд ученического коллектива. Мн., 1964; Организация общественно полезного труда в средней школе. Мн., 1969; Воспитание учащихся по месту их жительства. Мн., 1972; Идейно-нравственная подготовка школьников к труду. Мн., 1988 (у сааўт.); Воспитание юного гражданина-труженика. 2 изд. Мн., 1990.

ЧАРНЫШЭ́ЎСКІ Мікалай Гаўрылавіч (24.7.1828, г. Саратаў, Расія — 29.10.1889), рускі філосаф, пісьменнік, літаратурны крытык. Магістр (1855). Вучыўся ў Саратаўскай духоўнай семінарыі (1842—45), скончыў Пецярбургскі ун-т (1850). Працаваў выкладчыкам л-ры ў Саратаўскай гімназіі. З 1853 у Пецярбургу: супрацоўнічаў у час. «Отечественные записки», гал. рэдактар час. «Современник». У 1862 арыштаваны за дачыненне (не даказанае) да напісання праклямацыі «Панскім сялянам ад іх дабрадзеяў паклон», а ў 1864 прыгавораны сенацкім судом да катаргі і вечнага пасялення ў Сібіры. У 1883 пераехаў у Астрахань, потым у Саратаў. Светапогляд Ч. фарміраваўся пад уплывам ідэй класічнай ням. філасофіі (Г.Гегель, Л.Феербах), англ. паліт. эканоміі (Д.Рыкарда), франц. утапічнага сацыялізму (Ш.Фур'е і інш.), а таксама В.Р.Бялінскага, А.І.Герцэна, П.Леру, П.Ж.Прудона. У асн. філас. працы «Антрапалагічны прынцып у філасофіі» (1860) сцвярджаў, што чалавек мае адну рэальную натуру — матэрыяльную. У адрозненне ад Феербаха бачыў у чалавеку не толькі родавае, але і сац.-гіст. стварэнне. Лічыў, што на аснове сял. абшчыны, злучанай з навук.-тэхн. дасягненнямі Захаду, Расія ў стане перайсці да сацыялізму; шляхам да такога пераходу лічыў сац. рэвалюцыю. У рамане «Што рабіць?» (1863) даў вобразны малюнак «светлай і цудоўнай» будучыні чалавецтва — сацыялізму, які грунтуецца на грамадскай уласнасці. Эстэтыку разглядаў як «сістэму агульных прынцыпаў мастацтва ўвогуле і паэзіі ў асаблівасці». На яго думку, творы мастацтва ўзнікаюць на глебе сапраўдных патрэбнасцей чалавека (праўды, любові і паляпшэння быту), таму прадметам мастацтва можа і павінна стаць рэальная рэчаіснасць, а не штосьці абсалютнае і недасягальнае. У яго этычных поглядах узвялічваецца праца і людзі працы, асуджаецца марнае жыццё, адстойваецца разумны эгаізм асобы. Развіты Ч. рэаліст. традыцыі ў разуменні суадносін мастацтва і рэчаіснасці паўплывалі на творчасць многіх бел. пісьменнікаў і дзеячаў мастацтва пач. 20 ст. Пад ідэйным уплывам Ч. фарміраваўся светапогляд К.Каліноўскага. Сярод вучняў і паслядоўнікаў Ч. былі браты А.Д. і Б.Д. Трусавы і інш. Ідэйная спадчына Ч. стала адной з тэарэт. крыніц станаўлення бел. эстэтыкі; у 1920-я г. яе вывучалі С.Вальфсон, І.Герчыкаў і інш.

А.І.**Чарныш.**

А.Дз.**Чарнышэвіч.**

М.Г.**Чарнышэўскі.**

Тв.: Полн. собр. соч. Т. 1—16. М., 1939—53.

Літ.: Демченко А.А. Н.Г.Чернышевский: Науч. биогр. Ч. 1—4. Саратов, 1978—94; Н.Г.Чернышевский в воспоминаниях современников. М., 1982. *Т.І.Адула.*

ЧАРНЯ́ЕЎ Міхаіл Рыгоравіч (3.11.1828, г. Бендэр, Малдова — 16.8.1898), расійскі военачальнік. Ген.-лейт. (1882). Скончыў Магілёўскую гімназію (1840), Ваен. акадэмію Генштаба (1853). Удзельнік Крымскай (1853—56) і Каўказскай (1817—64) войнаў. У 1864—65 камандаваў Асобым зах.-сіб. атрадам, які ўдзельнічаў ва ўзяцці Чымкента, Ташкента і інш. Быў ваен. губернатарам Туркестанскага краю. За перавышэнне ўладных паўнамоцтваў звольнены ў адстаўку. У 1873—78 разам з ваен. публіцыстам ген. Р.А.Фадзеевым выдаваў у Пецярбургу газ. «Русский мир». Насуперак жаданню ўрада тайна ў 1876 выехаў у Бялград, дзе быў прызначаны галоўнакамандуючым сербскай арміяй, якая ў 1876 пацярпела паражэнні ў *серб-ска-чарнагорска-турэцкай вайне 1876—78*. У пач. рус.-тур. вайны 1877—78 залічаны на рас. ваен. службу, але ў дзеючую армію не прызначаны. У 1882—84 туркестанскі ген.-губернатар. З 1886 у адстаўцы. Памёр і пахаваны ў в. Тубышкі (з канца 18 ст. належала яго дзеду, стацкаму саветніку Мікіце Чарняеву) Круглянскага р-на Магілёўскай вобл.

Літ.: Памяць: Гіст.-дак. хроніка Круглянскага р-на. Мн., 1996; Сергеенкова В. Генерал М.Г.Черняев // Гісторыя Магілёва: Мінулае і сучаснасць: зб. навук. прац. Магілёў, 2003. Ч. 1. *Э.А.Карніловіч.*

ЧАРНЯ́К Апанас Рыгоравіч (15.9.1899, в. Пакоснае Краснаярскага краю, Расія — 25.10.1972), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1944). З 1942 на 1-м Бел. фронце. Сяржант Ч. вызначыўся 4.7.1944 у баях па ліквідацыі мінскага «катла»: у складзе артыл. батарэі ўдзельнічаў у адбіцці 6 контратак каля в. Вузляны Рудзенскага р-на; абкружаны ворагам, адзін агнём з кулямёта прадухіліў пагрозу акружэння батарэі.

ЧАРНЯ́К Аркадзь Аляксандравіч (н. 12.7.1955, г. Крамянчуг, Украіна), бел. матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (2001). Скончыў БДУ (1977). З 1977 у Ін-це надзейнасці машын, з 1992 у Бел. эканам. ун-це, з 2000 у Міжнар. ін-це прац. і сац. адносін (праф.). Навук. працы па матэм. тэорыі надзейнасці. Пабудаваў тэорыю дамінавання манатонных графаў, распрацаваў універсальныя камбінаторныя метады ў матэм. тэорыі надзейнасці, на аснове якіх вырашаны некалькі адкрытых задач аб алгарытмічнай складанасці вылічэння і ацэнкі паліномаў надзейнасці гіперграфаў з зададзенымі структурнымі ўласцівасцямі.

Тв.: К гипотезе Литтла о планарных графах // Весці АН БССР. Сер. фіз.-мат. навук. 1980. № 2; Структурно-сложные системы с пороговой живучестью // Дискретная математика. 1999. Т. 11, вып. 4.

ЧАРНЯ́К Сцяпан Іванавіч (25.12.1899, в. Чарневічы Барысаўскага р-на Мінскай вобл. — 21.7.1976), савецкі военачальнік, ген.-маёр (1944). Герой Сав. Саюза (1940). Скончыў курсы «Выстрал» (1930), Вышэйшыя курсы пры Ваен. акадэміі Генштаба (1941). У Чырв. Арміі з 1918 на Зах. фронце. Удзельнік вайны ў Іспаніі 1936—39. У час сав.-фінл. вайны 1939—40 дывізія, якую ён узначальваў, вызначылася пры прарыве «лініі Манергейма». У Вял. Айч. вайну нам. камандуючага Чарнаморскім флотам па пяхоце, на Калінінскім, Бел. і 1-м Бел. франтах: камандуючы арміяй, нам. камандзіра корпуса, камандзір дывізіі. Удзельнік абароны Севастопаля, вызвалення Беларусі, Варшавы, узяцця Берліна. Да 1958 у Сав. Арміі.

ЧАРНЯ́НСКІ ШКЛЯНЫ́ І ХРУСТАЛЁВЫ ЗАВО́Д. Дзейнічаў у 1892—1905 у в. *Чарняны* Брэсцкага пав. (цяпер вёска ў Маларыцкім р-не Брэсцкай вобл.). У розны час выпускаў аконнае і ліставое шкло, бутэлькі, хрусталёвы посуд. У 1900 меў 3 паравыя машыны, 3 паравыя катлы, 3 гаршковыя печы, гранільны і 115 шліфавальных станкоў. У 1905 працавала 398 рабочых.

ЧАРНЯ́НЫ, вёска ў Маларыцкім р-не Брэсцкай вобл., на р. Асіпоўка, на аўтадарозе Маларыта—Кобрын. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 23 км на ПнУ ад горада і чыг. ст. Маларыта, 53 км ад Брэста. 751 ж., 276 двароў (2003). Сярэдняя і муз. школы, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Магіла ахвяр фашызму. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — Прачысценская царква (1870-я г.). У Ч. у 1892—1905 дзейнічаў *Чарнянскі шкляны і хрусталёвы завод*.

ЧАРНЯ́СТА, возера ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Ловаць (цячэ праз возера), за 2 км на ПнУ ад в. Мяжа, за 40 км на ПнУ ад г. Гарадок. Пл. 1,9 км^2, даўж. 2,1 км, найб. шыр. 1,43 км, найб. глыб. 9 м, даўж. берагавой лініі 8,4 км. Пл. вадазбору 275 км^2. Катлавіна тэрмакарставага тыпу, авальная, выцягнута з Пн на Пд. Схілы катлавіны на У выш. 15—20 м, стромкія, на З нізкія, спадзістыя, пераважна пад лесам, месцамі разараныя. Берагі нізкія, пясчаныя, параслі водна-балотнай і хмызняковай расліннасцю. Пойма шыр. 10—15 м, забалочаная і ўкрытая хмызняком. Востраў пл. 0,8 га. Дно да глыб. 2—3 м пясчанае, глыбей ілістае. Шыр. паласы расліннасці 2—20 м да глыб. 1,2 м. Упадаюць 2 ручаі.

ЧАРНЯ́ЎКА, рака ў Мінскім р-не, у бас. р. Дняпро. Даўж. 24 км. Пл. вадазбору 108 км^2. Пачынаецца на паўд. ускраіне в. Мацкі, упадае ў Заслаўскае вадасх. на паўд. ускраіне в. Сёмкава. Рэчышча на асобных участках на працягу 8 км каналізаванае. Каля вёсак Юзуфова і Сялюты 2 плацiны і сажалкі.

ЧАРНЯ́ЎКА, рака ў Бярозаўскім р-не Брэсцкай вобл., левы прыток канала Вінец (бас. р. Прыпяць). Даўж. 20,8 км. Пл. вадазбору 76 км^2. Пачынаецца за 0,7 км на ПдЗ ад в. Варажбіты, вусце за 1,5 км на Пд ад в. Равяцічы. Рэчышча каналізаванае.

ЧАРНЯ́ЎКА, Перасуха, Бясіта, рака ў Быхаўскім р-не Магілёўскай вобл., правы прыток р. Гутлянка (бас. р. Дняпро). Даўж. 20 км. Пл. вадазбору 95 км^2. Пачынаецца каля ўсх. ускраіны в. Доўтае, вусце за 1 км на Пд ад в. Вець. Рэчышча на працягу 7,7 км ад вытоку і ніжэй (3 км) каналізаванае.

ЧАРНЯ́ЎКА, вёска ў Хоцімскім р-не Магілёўскай вобл., на р. Еленка. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 24 км на З ад г.п. Хоцімск, 177 км ад Магілёва, 19 км ад чыг. ст. Камунары. 215 ж., 100 двароў (2003). Пач. школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. У Ч. ў 1852—62 дзейнічала *Чарняўская цукровая мануфактура*.

ЧАРНЯ́ЎСКАЯ Леаніла Усцінаўна (16.11.1893, в. Таргуны Докшыцкага р-на Віцебскай вобл. — 26.9.1976), бел. пісьменніца. Жонка М.І.*Гарэцкага*. Скончыла Марыінскае вышэйшае вучылішча ў Вільні (1910). З 1911 настаўнічала, з 1919 выкладала ў Віленскай бел. гімназіі. З 1923 жыла ў Мінску, г. Горкі (Магілёўская вобл.). З 1932 у г. Вятка, пас. Пясочня (цяпер Калужскай вобл.), з 1947 у Ленінградзе. Першае апавяд. «Мікітка» (1921). Аўтар зб. «Дзяціныя гульні» (1919), чытанак «Родны край» (1919, перавыд. да 1936), кніг прозы «Валуй — камісар часоў кераншчыны», «Бяздзетуха», «Апавяданні», «Падарожніца» (усе 1930). Пісала для дзяцей: кн. «Варка» (1928), «Кот Знайдзён» (1929), «Андрэйка» (1930), «Перамога» (1932), «Сталёвы конь» (1938). Творчасці Ч. уласціва тонкае адчуванне роднага слова, добрае веданне псіхалогіі дзіцяці і дарослага, займальнасць апавядання. На бел. мову перакладала з рус. і англ. моў.

Тв.: Жук. Мн., 1960; Казёл Мэка і Кудла. Мн., 1979; Апавяданні. Мн., 1983.

І.П.Чыгрын.

ЧАРНЯ́ЎСКАЯ Тамара Ігнатаўна (н. 2.10.1934, Масква), бел. гісторык архітэктуры. Дачка І.Ц.*Дуброўскага*. Канд. архітэктуры (1967). Скончыла БПІ (1959). У 1960—92 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нац. АН, адначасова ў 1963—71 выкладчык БПІ. Даследуе гіст. планіроўку і забудову Віцебска, Магілёва, Мінска, помнікі архітэктуры Беларусі: раздзелы па горадабудаўніцтве 14, 17 і 18 ст. у «Гісторыі беларускага мастацтва» (т. 1—6, 1987—94), «Помнікі архітэктуры і мастацтва» ў серыі кніг «Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі» (Камянецкі р-н, 1997; Мядзельскі р-н, 1998; Нясвіжскі р-н, 2001, і інш.). Адзін з аўтараў і чл. рэдкалегіі «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» (1984—88) і інш. Дзярж. прэмія Беларусі 1990.

Тв.: Архітэктура Магілёва. Мн., 1973; Архітэктура Віцебска. Мн., 1980; Памятники архитектуры Минска XVII — начала XX в. Мн., 1984 (разам з А.Ю.Пятросавай).

ЧАРНЯЎСКАЯ ЦУКРО́ВАЯ МАНУФАКТУ́РА. Дзейнічала ў 1852—62 у маёнтку Чарняўка Клімавіцкага пав. (цяпер вёска ў Хоцімскім р-не Магілёўскай вобл.). Вырабляла цукар-пясок з цукр. буракоў уласнай вытворчасці. Мела паравы рухавік, 2 гідраўл. прэсы, 15 катоў і інш. У 1860—61 выпрацавала 1040 пудоў цукру-пяску; працавала 57 дзён. Прадукцыю збывалі ў Магілёўскай, Мінскай, Віцебскай і Палтаўскай губ.

ЧАРНЯЎСКІ Аляксандр Фёдаравіч (н. 14.9.1938, г. Разань, Расія), бел. вучоны ў галіне інфарматыкі. Акад. Нац. АН Беларусі (1994, чл.-кар. 1986). Д-р тэхн. н. (1973), праф. (1978). Засл. дз. нав. і тэхн. Беларусі (1979). Скончыў Разанскі радыётэхн. ін-т (1960). З 1962 у БДУ, з

С.І.**Чарняк**.

А.Ф.**Чарняўскі**.

І.Д.**Чарняхоўскі**.

1971 у НДІ прыкладных фіз. праблем БДУ (з 1979 дырэктар), адначасова з 1973 заг. кафедры БДУ. У 1997—2002 чл. Прэзідыума Нац. АН Беларусі. Навук. працы па распрацоўцы фізіка-тэхн. метадаў і вымяральна-выліч. сродкаў аўтаматызаванай апрацоўкі інфармацыі. Распрацаваў метады паралельна-канвеернай апрацоўкі інфармацыі, прынцыпы структурнай пабудовы вымяральных пераўтваральнікаў і лічбавых прылад мадулярнай экспрэс-апрацоўкі даных, адпаведную мікраэлектронную элементную базу. Дзярж. прэмія Беларусі 1986. Дзярж. прэмія СССР 1991.

Тв.: Статистические методы измерений в экспериментальной ядерной физике. М., 1980 (разам з А.В.Патапавым); Статистический анализ случайных потоков в физическом эксперименте. Мн., 1988 (разам з У.У.Апанасовічам, А.А.Калядой); Высокоскоростные методы и системы цифровой обработки информации. Мн., 1996 (у сааўт.).

ЧАРНЯЎСКІ Мікола (Мікалай Мікалаевіч; н. 16.1.1943, в. Буда-Люшаўская Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў БДУ (1966). Працаваў на Бел. радыё, з 1966 у час. «Бярозка», з 1989 у час. «Вясёлка». Друкуецца з 1958. Асн. тэмы твораў — услаўленне нар. подзвігу ў Вял. Айч. вайну, чалавечай дабрыні, шчырасці, сяброўства, харство роднай прыроды. Піша пераважна для дзяцей: зб-кі вершаў і казак «Дзе лета канчаецца» (1963), «Сонца ў хованкі гуляе» (1970), «Кліча горн» (1974), «Парад» (1976), «Я збіраюся на БАМ» (1979), «Хто сябруе з добрым днём?» (1981), «Зоркі-зорачкі» (1984), «Аб чым пяе крынічка» (1989), «Каго баіцца зубр?» (1994) і інш. Выступае як сатырык: зб-кі «Казёл-моднік» (1978), «І не косяць, і не жнуць...» (1981), «Камар на матацыкле» (1986), «Лёкса ў люксе» (1993). Многія яго вершы пакладзены на музыку. Перакладае на бел. мову творы малд., рус., укр. паэтаў. Літ. прэмія імя Я.Маўра 1995.

Тв.: Бегунок пачынае думаць: Аповесць. Мн., 1965; Чалавечнасць: Вершы. Мн., 1971; Звініць званок...: Вершы і паэмы. Мн., 1982; Навечна з сонцам: Дак. паэмы. Мн., 1986; Трывога: Вершы. Мн., 1988; У трох соснах...: Сатыра, гумар, лірыка. Мн., 1996; Хто пакрыўдзіў кракадзіла?: Вершы. Казкі. Прымаўлянкі-забаўлянкі. Скорагаворкі. Загадкі. Лічылкі — ад суму лячылкі. Мн., 1999; На каго сварыўся гром: Вершы і казкі. Мн., 2003.

Літ.: Зуёнак В. Паэзія і дзяцінства // Зуёнак В. Лінія высокага напружання. Мн., 1983.

ЧАРНЯЎСКІ Міхаіл Міхайлавіч (н. 7.3.1938, в. Круці Мядзельскага р-на Мінскай вобл.), бел. археолаг, пісьменнік. Канд. гіст. н. (1971). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1960). З 1966 у Ін-це гісторыі Нац. АН Беларусі (у 1990—2001 заг. аддзела археалогіі каменнага і бронзавага вякоў). Даследуе матэрыяльную і духоўную культуру плямён каменнага і бронзавага вякоў ПнЗ Беларусі, першабытнае мастацтва на Беларусі. Даследаваў помнікі фінальнага палеаліту, мезаліту і неаліту ў бас. Нёмана і Вілii, першабытныя стаянкі Крывінскага тарфяніка на Віцебшчыне. Вывучаў крэменездабыўныя шахты каля г.п. Краснасельскі і в. Карпаўцы Ваўкавыскага р-на, помнікі бронзавага веку Панямоння. Вылучыў *нёманскую культуру*, крывінскі варыянт *нарвенскай культуры*. Даследаваў сярэдневяковы г. Мядзел (1982), замак у Лоску Валожынскага р-на (1987). Аўтар навук., навук.-папулярных і празаічных твораў. Адзін з аўтараў «Нарысаў па археалогіі Беларусі» (ч. 1, 1970), кніг «Беларуская археалогія: Дасягненні археолагаў за гады Савецкай улады» (1987), «Гісторыя беларускага мастацтва» (т. 1, 1987), «Археалогіі Беларусі» (т. 1, 1997), «Гісторыі Беларусі» (т. 1, 2000).

Тв.: Неаліт Беларускага Панямоння. Мн., 1979; Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі. Мн., 1981; Страла Расамахі. Мн., 1985; Археалагічныя помнікі Міншчыны. Мн., 1988; Вогнепаклоннікі. Мн., 1996; Ілюстраваная гісторыя старажытнай Беларусі. Мн., 1997; Правадыр крылатых вершнікаў: Ян Кароль Хадкевіч. Мн., 1998. *Э.М.Зайкоўскі.*

ЧАРНЯХО́ЎСКАЯ КУЛЬТУ́РА, археалагічная культура плямён *жалезнага веку*, якія ў канцы 2 — сярэдзіне 5 ст. н.э. насялялі стэпы, лесастэпы ад Ніжняга Падунаўя да левабярэжжа Дняпра; на Пн дасягалі рубяжоў Бел. Палесся, дзе перамяжаліся з насельніцтвам вельбарскай і кіеўскай культур. На тэр. Беларусі рэчы Ч.к. знойдзены пры раскопках паселішча Лемяшэвічы Пінскага р-на. Насельніцтва займалася жывёлагадоўляй, земляробствам, рамёствамі. Ч.к. прадстаўлена селішчамі (размяшчаліся на паўд. схілах тэрас невял. рэк і ручаёў), гарадзішчамі (вядомы 3, умацаваныя валамі, равамі і каменнымі сценамі), грунтавымі могільнікамі.

Выяўлены 3 тыпы жытлаў: паўзямлянкі і зямлянкі каркасна-плятнёвай канструкцыі, наземныя глінабітныя і каменныя двухкамерныя дамы. На заключным этапе культуры будаваліся зрубныя дамы. На паселішчах выяўлены шматлікія гасп. пабудовы і ямы-сховішчы. Сярод знаходак пераважае кераміка (гаршкі, карчагі, міскі, вазы, збаны, кубкі), часта арнаментаваныя складанымі кампазіцыямі; ёсць лянны посуд, невял. колькасць ант. посуду, разнастайныя прылады працы, асабліва земляробчыя, прадметы побыту, упрыгожанні, дэталі адзення, зброі, рыштунку вершніка. Пахавальныя абрады — трупаспаленне і трупапалажэнне. Пахавальны інвентар уключае гасп. і быт. рэчы, упрыгожанні, вупраж. Вядома больш за 3 тыс. помнікаў Ч.к., з якіх вылучаюць 5 лакальных груп у залежнасці ад этн. складу насельніцтва (мяркуюць, што ў розных рэгіёнах у склад Ч.к. ўваходзілі скіфы-сарматы, геты-дакі, готы, славяне). У аснове Ч.к. — вытворча-тэхнал. дасягненні рымскіх правінцый і традыцыі народаў, якія яе стваралі. Частка насельніцтва Ч.к. ўдзельнічала ў фарміраванні слав. старажытнасцей 5—7 ст. *В.С.Вяргей.*

ЧАРНЯХО́ЎСКІ Іван Данілавіч (29.6.1906, с. Аксаніна Уманскага р-на Кіеўскай вобл., Украіна — 18.2.1945), савецкі ваен. дзеяч. Ген. арміі (1944). Двойчы Герой Сав. Саюза (1943, 1944). Скончыў Кіеўскую артыл. школу (1928), Ваен. акадэмію механізацыі і матарызацыі РСЧА (1936). У Чырв. Арміі з 1924. У 1938—41 у БВА: камандзір легкатанк. палка, нам. камандзіра танк. дывізіі. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Паўн.-Зах., Варонежскім, Цэнтр., 1-м Укр. франтах: камандзір танк. і стралк. дывізій, танк. корпуса, камандуючы арміяй. Удзельнік абароны Ноўгарада, Варонежа; вызначыўся ў Курскай бітве, *Чарнігаўска-Прыпяцкай аперацыі 1943*, Варонежска-Касторненскай, Кіеўскай, Жытомірска-Бярдзічаўскай, Роўна-Луцкай наступальных аперацыях. З крас. 1944

камандуючы войскамі 3-га Бел. фронту, якія разам з 1-м Прыбалт. фронтам ажыццявілі *Віцебска-Аршанскую аперацыю 1944*, а з 1-м і 2-м Бел. франтамі — *Мінскую аперацыю 1944*, стварылі *мінскі «кацёл»*; вызвалілі Віцебск, Оршу, Барысаў, Мінск, Ліду, Вільнюс і інш. населеныя пункты. Войскі на чале з Ч. першыя ўступілі ва Усх. Прусію і Паўн. Польшчу, выйшлі на подступы да г. Кёнігсберг. Каля г. Мельзак (цяпер г. Пянежна, Польшча) Ч. смяротна паранены. Каля в. Рэдзькі Дубровенскага р-на на месцы каманднага пункта Ч. мемар. пліта, у в. Сцешыцы Вілейскага р-на яго бюст. У гонар Ч. г. Інстэрбург Калінінградскай вобл. (Расія) перайменаваны ў г. Чарняхоўск.

Літ.: Люди бессмертного подвига. Кн. 2. 4 изд. М., 1975; Герои огненных лет. Кн. 6. М., 1983; Шарипов А.А. Черняховский. 3 изд. М., 1985; Алексеев Н.И. Осколком оборванная жизнь. 2 изд. М., 1983.

ЧАРО́МХА (Padus), род кветкавых раслін сям. ружавых. Каля 20 відаў. Пашыраны ў Еўразіі і Паўн. Амерыцы. На Беларусі 1 від — Ч. звычайная, або гронкавая (P. avium). Трапляецца па берагах рэк, у лясах, хмызняках, вырошчваецца ў садах і парках. Культывуюць Ч. віргінскую (P. virginiana), Маака (P. maackii), пенсільванскую (P. pensylvanica), познюю (P. serotina), якія часам дзічэюць.

Гронкі **чаромхі** звычайнай з кветкамі і ягадамі

Лістападныя дрэвы выш. 7—30 м, з густой шырокай кронай, радзей вял. кусты. Лісце простае, чаргаванае, прадаўгавата-яйцападобнае. Кветкі духмяныя, белыя, на ножках, сабраныя ў гронку. Плод — сакаўная касцянка, у многіх відаў ядомая. Драўніна — сыравіна для дрэваапр. прам-сці; плады спажываюцца ў ежу і як лек. сродак, корм для птушак. Ч. — каштоўная лясная парода, паляпшае структуру глебы, замацоўвае берагі рэк, схілы яроў. Харч., лек., меданосныя, дэкар. расліны.

ЧАРО́ПКА Вітаўт (Віктар Кузьміч; н. 21.8.1961, Мінск), бел. пісьменнік. З 1981 працаваў на Мінскім трактарным заводзе і інш. З 1990 у час. «Хрысціянская думка», «Спадчына», «Беларуская мінуўшчына»; з 1998 у «Беларускім гістарычным часопісе». Аўтар гіст. рамана «Храм без бога» (1992) пра падзеі на Беларусі ў 16 ст. Кнігі гіст.-літ. нарысаў «Імя ў летапісе» (1994) і «Уладары Вялікага княства» (1996) прысвечаны славутым постацям бел. гісторыі 10—17 ст. Зб. нарысаў «Гісторыя нашага імя» (1995) пра паходжанне назваў «Белая Русь» і «Літва». Даследуе язычніцкую культуру Беларусі.

Тв.: Перамога ценю: Аповесці. Апавяданні. Эсэ. Мн., 1996; Уладары Вялікага княства. 2 выд. Мн., 2002. *А.М.Карлюкевіч.*

ЧАРО́САВА ВО́ЗЕРА. У Лепельскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дзіва, каля в. Чаросава, за 20 км на ПнУ ад г. Лепель. Пл. 0,52 км^2, даўж. 1,6 км, найб. шыр. 500 м, найб. глыб. 12,2 м, даўж. берагавой лініі 3,74 км. Пл. вадазбору 13,3 км^2. Катлавіна лагчыннага тыпу, выцягнута з Пн на Пд. Схілы катлавіны выш. 5—10 м, на У да 15 м, пад лесам, на З і Пд спадзістыя, разараныя і пад хмызняком. Берагі выш. 0,5—0,8 м, месцамі зліваюцца са схіламі. Пойма шыр. 10—30 м вылучана асобнымі ўчасткамі. Дно да глыб. 3—4 м пясчанае, ніжэй ілістае. Зарастае да глыб. 2,2 м, шыр. паласы прыбярэжнай раслінасці 10—120 м. Упадаюць ручаі са Школьнага і Дзявочага азёр, выцякае ручай у воз. Астроўна.

ЧАРО́Т (Scirpus), род кветкавых раслін сям. асаковых. Больш за 250 відаў. Пашыраны ўсюды, пераважна ў тропіках і субтропіках. На Беларусі 4 віды Ч.: азёрны (S. lacustris), лясны (S. sylvaticus), самаўкараняльны (S. radicans), Табернемантана (S. tabernaemontani). Трапляюцца па берагах вадаёмаў і лясных ручаёў, па балотах, часта ў вадзе.

Адна- і шматгадовыя травяністыя расліны. Сцябло выш. да 3 м, акруглае ці 3-граннае, з унутр. рыхлай паветраноснай тканкай — аэрэнхімай. Лісце лінейнае, 3-граннае або ніткападобнае ці рэдукаванае. Кветкі ў падоўжана-яйцападобных каласках, сабраных у складанае суквецце, радзей адзіночныя. Плод — арэшак. Сцёблы выкарыстоўваюць для пляцёных вырабаў, як упаковачны, цеплаізаляцыйны і будаўнічы матэрыял. Часта Ч. няправільна наз. *трыснёг.*

ЧАРО́Т Міхась (сапр. Кудзелька Міхаіл Сымонавіч; 7.11.1896, г.п. Рудзенск Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. — 29.10.1937), бел. паэт, грамадскі і культ. дзеяч. Скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю (1917). Мабілізаваны ў армію. З 1918 у Мінску. Уваходзіў у арг-цыю *«Маладая Беларусь»*, *Часовы Беларускі нацыянальны камітэт*, у 1920 адзін з арганізатараў *Беларускай камуністычнай арганізацыі*. З 1920 супрацоўнік, у 1925—29 рэдактар газ. «Савецкая Беларусь». Адзін з ініцыятараў стварэння і з 1923 кіраўнік аб'яднання бел. пісьменнікаў *«Маладняк»*. З 1927

М.**Чаўот**.

І.А.**Чарота**.

чл. аб'яднання бел. пісьменнікаў *«Полымя»*, пазней БелАПП. Удзельнічаў у культ.-нац. жыцці: спяваў у хоры У.Тэраўскага пры «Беларускай хатцы», быў старшынёй тэатр. гуртка «Маладзік». У 1930-я г. рэдактар Бел. дзярж. выд-ва, літ. кансультант Саюза пісьменнікаў Беларусі. Канд. у чл. ЦК КП(б)Б у 1925—30. Канд. у чл. ЦВК БССР у 1922—24, чл. ЦВК БССР у 1924—31. 24.1.1937 арыштаваны. 28.10.1937 прыгавораны да вышэйшай меры пакарання, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1956. Друкаваўся з 1918. Пачатковы этап творчасці адметны нац.-патрыят. гучаннем. Пасля 1921 дамінуюць рэв.-пралетарскія матывы: зб-кі вершаў «Завіруха» (1922), «Выбраныя вершы» (1925), «Сонечны паход» (1929). У паэме «Босыя на вогнішчы» (1922) паэт. версія рэвалюцыі на Беларусі. У паэме-фантазіі «Чырванакрылы вяшчун» (1923) маст. ідэалі-

1 2

Чарот: 1 — марскі; 2 — азёрны.

зацыя вобраза «ўсясветнай камуны». Паэма «Беларусь лапцюжная» (1924) пра паслярэв. жыццё, збліжэнне горада і вёскі. У паэме «Марына» (1925) героіка-рэв. змаганне часоў грамадз. вайны на фоне рамант. і фальклорна-ідэалізаванага кахання. У паэме «Карчма» (1925) тэма мінулага і сучаснага Беларусі. Зб. апавяд. «Веснаход» (1924) пра бел. рэчаіснасць 1920-х г. Прыгодніцкая аповесць «Свінапас» (1923—24; на яе аснове створаны 1-ы бел. маст. фільм «Лясная быль», 1926) пра падзеі грамадз. вайны. Аўтар нар. драмы «На Купалле» (нап. 1921, паст. БДТ-1, 1921, не зберагласяся; адноўлены тэкст апубл. ў 1982), вадэвіль «Мікітаў лапаць» (апубл. 1923, паст. Першым т-вам бел. драмы і камедыі; ролю Мікіты выконваў аўтар; БДТ-3, 1923; Бел. т-рам імя Я.Купалы, 1979), дзіцячых п'ес «Данілка і Алеська» (1920), «Пастушкі» (1921) і інш. У 1930-я г. практычна адышоў ад літ. дзейнасці. Апошні верш Ч. «Прысяга» пра асабістую невінаватасць напісаны на сцяне мінскай турмы, захаваў у памяці М.Хведаровіч. Асобныя вершы Ч. пакладзены на музыку. На тэкст п'есы «На Купалле» А.Туранкоў стварыў оперу «Кветка шчасця» (1940).

Тв.: Зб. тв. Т. 1—2. Мн., 1958; Выбранае. Мн., 1982.

Літ.: Ярош М. Міхась Чарот: Нарыс жыцця і творчасці. Мн., 1963; Багдановіч І.Э. Міхась Чарот // Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. Мн., 1999. Т. 2; Яе ж. Авангард і традыцыя: Бел. паэзія на хвалі нац. адраджэння. Мн., 2001. *І.Э.Багдановіч.*

«ЧАРО́Т», бел. народны танец. Засн. на чаргаванні павольнай (муз. памер $^4/_4$) і хуткай (муз. памер $^2/_4$) частак. Вядомы ў 2 варыянтах: танц. карагод і імітацыйна-выяўл. (2 рады танцуючых імітуюць гойданне чароту ад ветру). Выконваецца мяшанымі парамі або толькі дзяўчатамі. Зафіксаваны ў 1932 у Бярозаўскім р-не Брэсцкай вобл. Сцэн. рэдакцыі створаны балетмайстрамі І.Хворастам і А.Рыбальчанкам. *В.М.Яшчанка.*

ЧАРО́ТА Іван Аляксеевіч (н. 16.9.1952, в. Лышчыкі Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. літаратуразнавец, перакладчык. Д-р філал. н. (1998). Праф. (1999). Скончыў БДУ (1974). Працаваў настаўнікам, з 1977 у БДУ (з 1996 заг. кафедры). Даследуе гісторыю літаратур і культур слав. народаў, гісторыю праваслаўя. Аўтар манаграфій «Беларуская савецкая літаратура за мяжой» (1988, у сааўт.), «Савецкая літаратура ў сувязях і ўзаемадзеяннях: (Пачатак параўнальнага і сістэмнага аналізу)» (1989), «Пошук спрадвечнай існасці: Беларуская літаратура XX ст. ў працэсах нацыянальнага самавызначэння» (1995), «Мастацкі пераклад на беларускую мову: Асновы тэорыі і практычныя рэкамендацыі» (1997), «Сербская праваслаўная царква» (1998), «Югаславянскія літаратуры і культуры» (1999, з М.Трусам), «Беларуская мова і царква» (2000). Выдаў на сербскай мове ў Югаславіі «Анталогію беларускай паэзіі» (1993), «Анталогію лірыкі ўсходніх славян» (2000), на Беларусі — анталогію «Сербская літаратура: Анталогія тэкстаў» (кн. 1—2, 2002—03). Складальнік зб. «Сербская паэзія» (1989, з М.Джэркавічам). Перакладае на бел. мову творы сербскай, харвацкай, македанскай, славенскай, польскай і інш. л-р, на сербскахарвацкую — творы бел. пісьменнікаў.

Тв.: Югаславянскія казкі. Мн., 1999; Косовская битва продолжается. Мн., 2000; Насустрач духу: Анталогія бел. хрысціянскай паэзіі. Мн., 2001; Насустрач духу: Анталогія бел. хрысціянскай прозы. Мн., 2002; Слово и Дух: Антология рус. духовной поэзии (X—XX вв.). Мн., 2003. *М.В.Трус.*

Чаротнік белы.

Чаротніца трыснёгападобная.

ЧАРО́ТАВАЯ АЎСЯ́НКА, птушка атр. вераб'інападобных, гл. ў арт. *Аўсянкі.*

ЧАРО́ТНІК (Rhynchospora), род кветкавых раслін сям. асаковых. Каля 200 відаў. Пашыраны ўсюды, пераважна ў тропіках і субтропіках Амерыкі. На Беларусі 1 від — Ч. белы (R. alba). Трапляецца па берагах зарослых азёр, на тарфяных балотах, забалочаных лугах.

Шматгадовыя травяністыя расліны выш. да 40 см. Утвараюць дзярнінкі. Сцёблы аблісцелыя, 3-гранныя. Лісце вузкае. Кветкі двухполыя, у каласках, суквецці галоўчатыя або пучкападобныя, з некалькіх каласкоў. Плод — арэшак.

ЧАРО́ТНІЦА (Phalaroides), род кветкавых раслін сям. метлюжковых (злакавых). 1 від — Ч. трыснёгападобная (P. arundinacea). Пашырана ў Паўн. паўшар'і і Паўд. Амерыцы. На Беларусі трапляецца ў поймах рэк на заліўных лугах, балотах. Разнавіднасць Ч. з белапаласатым лісцем пад назвай «шаўковая трава» культывуецца як дэкар. расліна.

Шматгадовая травяністая расліна выш. 50—200 см з доўгімі паўзучымі каранямі. Сцёблы густаабліснелыя. Лісце шырокалінейнае, па краі і ўнізе вострашурпатае. Каласкі аднакветкавыя, бледна-фіялетавыя, сабраныя ў аднабокую галінастую мяцёлку даўж. 5—20 см. Плод — зярняўка. Кармавая і дэкар. расліна.

ЧАРО́ТНІЦЫ (Gallinula), род птушак сям. пастушкоў атр. жураўлепадобных. 12 відаў. Пашыраны ўсюды, акрамя Аўстраліі і Антарктыды, пераважна ў тропіках Паўд. Амерыкі і Афрыкі. Жывуць у зарасніках вакол вадаёмаў. На Беларусі 1 від — Ч. звычайная (G. chloropus), нар. назвы вадзяная курка, вял. вадзяная курачка. 2 яе падвіды (гавайскі і гуамскі) занесены ў Чырв. кнігу МСАП.

Даўж. да 35 см, маса да 450 г. Цела сціснутае з бакоў. Апярэнне шыферна-чорнае або зеленавата-сіняе, падхвосце белае. Характэрна невял. налобная бляшка — чырв., блакіт-

Чаротніца звычайная.

ная, жоўтая або зеленаватая. Дзюба кароткая, вострая. Ногі і пальцы доўгія. Нясуць 4—12 яец. Кормяцца пераважна расл. кормам, радзей насякомымі і іх лічынкамі і інш. Аб'екты палявання.

«ЧАРО́ЎНАСЦЬ» (англ. charm) у фізіцы элементарных часціц, спецыфічны адытыўны *квантавы лік*, які характарызуе *адроны* ці *кваркі*. Часціцы з ненулявым значэннем «Ч.» наз. «зачараванымі» і маюць прынцыповае значэнне для праверкі тэарэт. палажэнняў *квантавай хромадынамікі*. «Ч.» захоўваецца ў моцных і эл.-магн. узаемадзеяннях; у распадах «зачараваных» часціц, якія адбываюцца за кошт слабага ўзаемадзеяння, «Ч.» змяняецца на адзінку.

«ЧАРО́ЎНАЯ ФЛЕ́ЙТА» («Zauberflöte»), кодавая назва карнай аперацыі ням. фашыстаў супраць падпольшчыкаў, партызан і насельніцтва г. Мінска 17—22.4.1943 у Вял. Айч. вайну. Праводзілася сіламі паліцыі бяспекі і СД генеральнай акругі Беларусь, 2-га ням. паліцэйскага палка, батальёна 23-га палка СС, асобага батальёна СС Дырлевангера, узмоцненай штабной роты, 12-й танк. роты, часцей вермахта (2800 гітлераўцаў), ахоўных чыг. падраздзяленняў, групы запасу і палявой жандармерыі. Горад быў падзелены на 6 частак, кожную з якіх блакіравалі карнікі. Фашысты прачэсвалі жылыя дамы і руіны, правяралі цягнікі, з горада нікога не выпускалі. На зборныя пункты было сагнана каля 52 тыс. жыхароў; мужчын 14—60 гадоў і жанчын 16—45 гадоў забіралі для вывазу на працу ў Германію. У час аперацыі патрыёты наладжвалі ўзбр. супраціўленне.

ЧАРО́Х, Чарух (тур. Çoruh), рака ў Турцыі і Грузіі. Даўж. 438 км (у Грузіі — ніжняе цячэнне, 26 км), пл. бас. 22 тыс. км^2. Большая ч. рэчышча — у тэктанічнай даліне паміж хр. Лазістанскім і Чарох, упадае ў Чорнае м. каля г. Батумі. Вясенне-летняе разводдзе. Сярэдні расход вады 285 м^3/с. Выкарыстоўваецца пераважна для арашэння. На Ч. — г. Байбурт (Турцыя).

ЧАРПЕ́ЦКАЕ ВО́ЗЕРА, адна з назваў *Чарапецкага возера* ў Расонскім р-не Віцебскай вобл.

ЧАРСТВО́Й Яўген Давыдавіч (н. 8.9.1945, г. Быхаў Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне паталагічнай анатоміі. Д-р мед. н. (1983), праф. (1986). Скончыў Бел. мед. ун-т (1969), дзе і працуе (у 1984—87 заг. кафедры, адначасова гал. дзіцячы паталагаанатам Мін-ва аховы здароўя Беларусі). Навук. працы па тэраталогіі чалавека, праблемах інфекц. захворванняў, марфалогіі шчытападобнай залозы.

Тв.: Наследственные синдромы множественных врожденных пороков развития. Мн., 1983; Патоморфология щитовидной железы детей Республики Беларусь, подвергшихся радиоактивному воздействию в результате аварии на Чернобыльской АЭС. Мн., 1993.

ЧАРСЦВЯ́ЦКАЕ ВО́ЗЕРА, Чарсцвяты, возера ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дзіва, каля в. Слабада, за 15 км на У ад г.п. Ушачы. Уваходзіць ва *Ушацкую групу азёр*. Пл. 9,35 км^2, даўж. 6,9 км, найб. шыр. 2,5 км, найб. глыб. 4,3 м, даўж. берагавой лініі

Чарсцвяцкае возера.

19,2 км. Пл. вадазбору 152 км^2. Катлавіна тэрмакарставага тыпу, авальная, выцягнутая з ПнЗ на ПдУ. Схілы катлавіны выш. 5—10 м, на Пд і З 10—18 м, стромкія, на З і ПдЗ тэрасаваныя. Берагі нізкія, пясчаныя, паступова пераходзяць у вузкую забалочаную пойму, якая на ПдЗ, ПдУ і ПнУ месцамі шыр. да 150 м. Дно да глыб. 0,5—1 м пясчанае, ніжэй сапрапелістае. 8 астравоў агульнай пл. 0,8 км^2. Шыр. паласы надводнай расліннасці ад 20 да 200 м. Упадае р. Выдрыца і 3 ручаі, выцякае ручай у воз. Павульскае.

ЧАРТАМЛЫ́К, адзін са скіфскіх *царскіх курганоў* канца 4 ст. да н.э. каля с. Чкалава Нікапальскага р-на Днепрапятроўскай вобл. (Украіна). Раскапаны ў 1862—63 рас. археолагам І.Я.*Забеліным*. Пад насыпам (вышыня 20 м, дыяметр каля 350 м) адкрыты 2 калодзежы глыбінёй каля 11 м і некалькі пячорападобных ніш, у якіх былі пахаваны цар і царыца, а таксама 6 рабоў-слуг. У 3 ямах знойдзены шкілеты 11 коней у зброі з золата, серабра і бронзы. Выяўлены сярэбраныя і залатыя ўпрыгожанні, зброя, сярэбраны посуд, бронзавыя катлы для ахвярнай ежы, амфары для віна і інш. Найб. значныя знаходкі: сярэбраная амфара з рэльефамі скіфаў, якія ўтаймоўваюць дзікіх коней, залатая абкладка ножан мяча з выявамі сцэн бітвы скіфаў і амазонак, залатая пласціна футарала для лука са сцэнамі з жыцця Ахіла.

Літ.: Гл. да арт. *Скіфы*.

Да арт. **Чартамлык**. Сярэбраная амфара з Чартамлыкскага кургана.

ЧАРТАПАЛО́Х (Carduus), род кветкавых раслін сям. складанакветных. Каля 120 відаў. Пашыраны ў Еўразіі, Паўн. Афрыцы, заносныя — у Амерыцы, Аўстраліі. На Беларусі 5 відаў Ч.: дробнагаловы (C. pycnocephalus); калючы (C. acanthoides); кучаравы (C. crispus), нар. назвы бадзюлі, растроп, дзядоўнік; паніклы (C. nutans); кручочкавы (C. hamulosus). Трапляюцца па берагах рэк і ручаёў, у хмызняках, пасевах, каля жылля, на сметніках.

Двух- і шматгадовыя калючыя травяністыя расліны выш. 0,3—2 м. Сцябло часцей з калюча-зубчастымі крыльцамі. Лісце чаргаванае, па краі з доўгімі калючкамі. Кветкі трубчастыя, звычайна пурпурныя, у кошыку. Плод — сямянка. Пустазелле. Меданосныя, алейныя, дэкар. расліны.

ЧАРТАРЫ́ЙСКІ Адам Ежы (Адам Юрый; 14.1.1770, Варшава — 15.7.1861), польскі і рас. дзярж. дзеяч. З роду *Чартарыйскіх*. Пасля ўдзелу ў абарончай вайне супраць Расіі 1792 эмігрыраваў. Каб захаваць маёнткі ад канфіскацыі рас. ўладамі, Чартарыйскія вымушаны былі паслаць у Пецярбург Ч. і яго брата К.А.*Чартарыйскага* як заложнікаў. З 1796 камер-юнкер і ад'ютант вял. князя Аляксандра Паўлавіча (будучы імператар Аляксандр I), з якім пасябраваў. З 1799 пасланнік у Сардзінію. Пасля ўступлення на трон Аляксандра I (1801) выкліканы ў Пецярбург, бліжэйшы дарадца імператара. З 1802 таварыш міністра, у 1804—06 міністр замежных спраў. У 1803—24 куратар *Віленскай навучальнай акругі*. Ідэйны натхняльнік 3-й антыфранцузскай кааліцыі, распрацаваў яе паліт. канцэпцыю; у выніку Расія заключыла саюз з Аўстрыяй і абвясціла вайну Напалеону I (1805). Склаў план пасляваеннай перабудовы Еўропы, які прадугледжваў аднаўленне Рэчы Паспалітай у палітыка-дынастычнай уніі з Рас. імперыяй. На аўдыенцыі 17.4.1810 выклаў план адраджэння Вялікага княства Літоўскага. Выступаў супраць неадкладнай рэалізацыі *Агінскага плана 1811*, адмоўна ставіўся да «літоўскіх» планаў цара. У час вайны 1812 знаходзіўся ў Карлсбадзе, потым у Вене.

Пасля разгрому Напалеона ўдзельнічаў у арганізацыі новай адміністрацыі Варшаўскага княства. Дарадца імператара Аляксандра I па польскім пытанні на Венскім кангрэсе, рэдактар Канстытуцыі Каралеўства Польскага. Атрымаў пасаду сенатара-ваяводы і чл. Адм. рады ў Варшаве. У 1823 спрабаваў умяшацца ў справу зняволеных *філаматаў*, не дамогшыся вынікаў, падаў у адстаўку з пасады куратара Віленскай навуч. акругі. Пасля смерці Аляксандра I (1825) адзін з лідэраў легальнай кансерватыўнай апазіцыі супраць антыпольскай палітыкі Мікалая I. У час *паўстання 1830—31* узначальваў Сенат і кансерватыўны Нац. ўрад у Варшаве, перашкаджаў правядзенню сац. і паліт. пераўтварэнняў. За ўдзел у паўстанні пазбаўлены княжацкага тытула і дваранскай годнасці ў Рас. імперыі. Эмігрыраваў у Англію, пасля ў Францыю. Яго парыжская рэзідэнцыя («Атэль Ламбер») стала цэнтрам канспіратыўнай дзейнасці кансерватыўна-манархічнай плыні польскай паліт. эміграцыі. Развіваў праграму аднаўлення незалежнай Рэчы Паспалітай пры падтрымцы зах.-еўрап. дзяржаў, аднак быў праціўнікам самаст. польскага нац.-вызв. руху і рэв. пераўтварэнняў. Аўтар паліт. і публіцыст. твораў, успамінаў, навук. даследаванняў, вершаў.

А.Е.**Чартарыйскі**.

Літ.: Крисань М.А. Адам Ежи Чарторыский // Вопр. истории. 2001. № 2; Kukiel M. Książę Adam. Warszawa, 1993; Dziewanowski M.K. Książe wielkich nadziei: Biografia księcia Adama Jerzego Czartoryskiego. Wrocław, 1998. *А.У.Ерашэвіч.*

ЧАРТАРЫ́ЙСКІ Адам Казімір (1.12.1734, г. Гданьск, Польшча — 19.3.1823), дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай. Фельдмаршал аўстр. арміі (1808). З роду князёў *Чартарыйскіх*. Выбіраўся паслом на соймы 1756, 1758, 1760, 1762. З 1758 генеральны староста падольскі. У 1764 выбраны маршалкам канвакацыйнага сойма і фаміліяй Чартарыйскіх вылучаны кандыдатам на трон Рэчы Паспалітай, але пад націскам Кацярыны II адмовіўся ад яго на карысць свайго стрыечнага брата С.А.Панятоўскага. Ініцыятар (разам з фаміліяй) правядзення карэнных рэформ дзярж. ладу Рэчы Паспалітай. У 1766 яму даручана рэфармаванне войска ВКЛ. У 1767 далучыўся да *Радамскай канфедэрацыі* і ўзначаліў магнацкую апазіцыю каралю. У выніку канфлікту з каралём выехаў за мяжу. З 1768 камендант Варшаўскага кадэцкага корпуса, камандзір палка пешай літоўскай гвардыі, ген.-лейтэнант (1775), камандзір 1-й і 2-й дывізій войска ВКЛ (да 1783). У 1773—76 чл. *Адукацыйнай камісіі*. У 1786 атрымаў ад імператара Іосіфа II тытул князя «Свяшчэннай Рымскай імперыі» для сябе і сваіх нашчадкаў, а для старэйшага ў родзе — тытул герцага Галіцыйскага каралеўства. Выбраны паслом на *Чатырохгадовы сойм 1788—92*, прыхільнік *Канстытуцыі 3 мая 1791*, зблізіўся з каралём. Адмовіўся ад патрабаванняў Расіі далучыцца да *Таргавіцкай канфедэрацыі* і выехаў у Вену. Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) асн. маёнткі Ч. апынуліся ў Аўстрыі і ён прыняў аўстрыйскае падданства. У 1809 прыняў падданства Варшаўскага княства. Пасля прыходу войск Напалеона ў Варшаву ў 1812 выбраны маршалкам Надзвычайнага сойма і Генеральнай канфедэрацыі. Пазней адышоў ад паліт. дзейнасці. Рэзідэнцыя Ч. ў Пулавах была асяродкам грамадска-паліт. і культ. дзейнасці. *А.У.Ерашэвіч.*

ЧАРТАРЫ́ЙСКІ Канстанцін Адам (Аляксандр Казімір; 28.10.1773, Варшава — 20.3.1860), польскі і рас. вайск. і дзярж. дзеяч. З роду *Чартарыйскіх*. У 1795 разам з братам А.Е.*Чартарыйскім* адпраўлены ў Пецярбург і залічаны афіцэрам у лейб-гвардыі Ізмайлаўскі полк, потым — камер-юнкерам. З 1796 ад'ютант вял. князя Канстанціна Паўлавіча ў чыне ген.-маёра. У 1798 атрымаў дазвол вярнуцца на радзіму і пасяліўся ў маёнтку Пулавы. У час аўстра-франц. вайны 1809 змагаўся на баку Напалеона I як генерал Варшаўскага княства; у вайну 1812 вызначыўся ў Смаленскай бітве, цяжка кантужаны пад Барадзіном. Пасля ўтварэння Каралеўства Польскага з 1815 каралеўскі ген.-ад'ютант пры імператару Аляксандру I. З 1828 у Вене. У час паўстання 1830—31 выконваў дыпламат. місію ад А.Е.Чартарыйскага да К.Метэрніха. Меў маёнткі на Беларусі (Воўчынскі і Рэчыцкі ключы). *А.У.Ерашэвіч.*

ЧАРТАРЫ́ЙСКІЯ, Чартарыскія, Чартарыжскія, княжацкі род герба «Пагоня» ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Паводле генеалагічнай традыцыі вялі радаслоўную ад кн. Канстанціна Альгердавіча (?—1390); пры гэтым спасылаліся на сваяцтва з вял. кн. *Альгердам*, пацверджанае польскім каралём Уладзіславам III граматай ад 14.6.1442. Аднак гісторыкі 19 ст. выказвалі сумненні ў верагоднасці гэтай граматы і схіляліся да версіі пра іх бел. паходжанне. Прозвішча атрымалі ў 15 ст. ад свайго маёнтка Чартарыйск на р. Стыр на Палессі (Луцкі пав. Валынскага ваяв.). Княжацкі тытул Ч. зацверджаны на Люблінскім сойме 1569, у Аўстрыі ў 1785, у Каралеўстве Польскім у 1819. На Беларусі ў розны час валодалі Лагойскам, Глускам, Карэлічамі, Шкловам і інш. У канцы 16 ст. перайшлі з праваслаўя ў каталіцтва. Пачынальнікам роду Ч. лічыцца кн. Васіль (? — пасля 1417), уладальнік маёнтка Чартарыйск; яго сынамі былі Іван (? — каля 1460), Аляксандр (? — пасля 1477) і Міхаіл (? — да 1489). Патомства Аляксандра (лагойская галіна роду) у мужчынскім родзе згасла ў 16 ст. Ад унукаў Міхаіла (валынская галіна) паходзяць 2 асн. лініі роду Ч.: ад Аляксандра Фёдаравіча (? — 1571) — чартарыйская лінія

1 2 3

Чартапалох: 1 — калючы; 2 — кручочкавы; 3 — панікла.

(скончылася ў 1606), ад Івана Фёдаравіча (? — 1567) — клеванская лінія. Ад унука Івана Фёдаравіча — Мікалая Юрыя Ч. (? — 1662) — пайшлі 2 новыя галіны роду: старэйшая клеванская (яе прадстаўнікі ў наш час жывуць у Польшчы і краінах Зах. Еўропы), і малодшая карэцкая (згасла ў 1810). Асаблівае значэнне ў паліт. жыцці Рэчы Паспалітай Ч. мелі ў 18 ст., калі ўзначальвалі моцную групоўку магнатаў — фамілію, якая ў 2-й чвэрці — 2-й пал. 18 ст. спрабавала правесці рэформы дзярж. і эканам. ладу Рэчы Паспалітай, арыентавалася на Расію, а пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай узначаліла магнацкую апазіцыю. Гал. рэзідэнцыя Ч. была ў г. Пулавы (Люблінскае ваяв.). Найб. вядомыя: Васіль (? — пасля 1417), сын кн. Канстанціна Альгердавіча. З 1393 пры двары Ягайлы, валодаў Лагойскам. Іван (? — каля 1460), сын Васіля. Адзін з удзельнікаў змовы і забойства вял. князя ВКЛ Жыгімонта Кейстутавіча (1440), уваходзіў у раду вял. князя Свідрыгайлы. Аляксандр (? — пасля 1477), сын Васіля. Канюшы вял. князя ВКЛ Жыгімонта Кейстутавіча ў 1440. Удзельнічаў у яго забойстве, таму вымушаны быў уцячы ў Маскву. У 1461 вярнуўся ў ВКЛ і атрымаў ад вял. князя ВКЛ Казіміра IV Лагойск, Асташын, Камянец. Міхаіл (? — да 1489), сын Васіля. Пасля забойства вял. князя Жыгімонта Кейстутавіча эмігравaў у Венгрыю. У 1444 вярнуўся, у 1445—51 маршалак дворны вял. князя Свідрыгайлы. Праціўнік экспансіі Польшчы на Валынь. У 1452 разам з братам Іванам дапамог сілам ВКЛ заняць Луцк, прызначаны намеснікам Брацлаўскім. Сямён (? — пасля 1524), сын Аляксандра, намеснік камянецкі ў 1507—18, староста чачэрскі і прапойскі, валодаў Лагойскам. Казімір (1674 — 31.8.1741), сын Міхаіла Юрыя, падчашы ВКЛ у 1699—1707 і 1709—12, падскарбі вялікі ВКЛ у 1707—09 (прызначаны Станіславам Ляшчынскім), падканцлер ВКЛ у 1712—24, кашталян віленскі з 1724). У час бескаралеўя 1696—97 прыхільнік на каралеўскі трон франц. прынца Францыа Луі дэ Канці. У 1706 перайшоў на бок Станіслава Ляшчынскага, пазней супрацоўнічаў з Аўгустам II і Аўгустам III. У 1730-я г. арганізаваў магнацкую групоўку Ч. і звязаных з імі іншых родаў (фамілію), якая разлічвала з дапамогай Расіі ўмацаваць дзярж. лад Рэчы Паспалітай. Міхаіл Фрыдэрык (26.4.1696—13.8.1775), сын Казіміра, паліт. кіраўнік фамілii ў 1740—70-я г. Падстолі ВКЛ у 1720—22, кашталян віленскі ў 1722—24, падканцлер ВКЛ у 1724—52, канцлер ВКЛ з 1752; староста гродзенскі, гомельскі, купішскі. Пасля смерці Аўгуста II (1733) прыхільнік Станіслава Ляшчынскага, у 1736 пагадзіўся з Аўгустам III. У 1744—50 спрабаваў рэфармаваць дзярж. лад Рэчы Паспалітай, абапіраючыся на падтрымку Расіі і Аўстрыі. Пасля смерці Аўгуста III (1763) у 1764 пад аховай рас. войск арганізаваў у Вільні Генеральную канфедэрацыю ВКЛ, скіраваную супраць К.С.*Радзівіла* Пане Каханку, і дамогся яго выгнання з краіны. Аднак Кацярына II, каб не ўзмацняць фамілii, арганізавала ў 1767 *Радамскую канфедэрацыю* на чале з Радзівілам. Да антырас. *Барскай канфедэрацыі* ён не далучыўся, але выступаў супраць выкарыстання рас. войск для яе падаўлення. Удзельнічаў у дэлегацыі, якая падпісала трактат аб прызнанні 1-га падзелу Рэчы Паспалітай. У 1763—64 як галава фамілii падтрымліваў кандыдатуру свайго пляменніка Адама Казіміра на трон Рэчы Паспалітай. Адам Казімір (1.12.1734—19.3.1823), сын Аўгуста Аляксандра, гл. *Чартарыйскі* А.К. Адам Ежы (14.1.1770—15.7.1861), сын Адама Казіміра, гл. *Чартарыйскі* А.Е. Канстанцін Адам (28.10.1773—20.3.1860), сын Адама Казіміра, гл. *Чартарыйскі* К.А. Уладзіслаў (3.7.1828, Варшава — 23.6.1894), сын Адама Ежы, польскі паліт. дзеяч. Лідэр кансерватыўнай плыні польскай эміграцыі («Атэль Ламбер») пасля смерці бацькі. У час *паўстання 1863—64* прадстаўнік на Захадзе польскага Нац. ўрада, супрацоўнічаў з партыяй «белых». Старшыня гіст.-літаратурнага т-ва ў Парыжы. Пераехаў ў Галіцыю, у 1876 заснаваў у Кракаве Музей Чартарыйскіх. *А.П.Грыцкевіч.*

ЧАРТКО́ Мікалай Канстанцінавіч (н. 8.1.1934, в. Мастытычы Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. географ, глебазнавец. Д-р геагр. н. (1991), праф. (1993). Скончыў БДУ (1957). З 1969 працуе на кафедры глебазнаўства і геалогіі БДУ. Навук. працы па геаграфіі, экалогіі і фізіцы глеб, геахіміі, геахім. экалогіі, матэм. метадах у геаграфіі.

Тв.: Геохимия ландшафта. Мн., 1981; Основы геохимии. Мн., 2001; Геохимическая экслогия. Мн., 2002.

ЧАРТО́ВІЧ Аляксандр Іванавіч (н. 1.3.1946, в. Цагельня Руднянскага р-на Смаленскай вобл., Расія), бел. мастак кіно, жывапісец. Засл. дз. мастацтваў Беларусі (1992). Скончыў Усесаюзны ін-т кінематаграфіі ў Маскве (1971). З 1971 на кінастудыі «Беларусьфільм». Мастак-пастаноўшчык фільмаў «Вянок санетаў» (1976), «Дзікае паляванне караля Стаха» (1979), «Паводка» (1980), «Зацішша» (1981), «Сад» (1982), «Снайперы» (1984), «Рыжы, сумленны, закаханы» (1984), «Асенні падарунак фей» (1985), «Хам», «Гладыятар па найме» (абодва 1990), «Гульня ўяўлення» (1998), «Армія ратавання» (1999), «Момант ісціны» (2000). Працуе ў жывапісе: «Незакончаны нацюрморт з галавой каня», «Два спосабы пасадкі камара», «Два стагоддзі» (усе 1998), «Матылёк на траве», «Адчыненыя дзверы» (абедзве 1999). Вял. ўвагу аддае жывапіснай фактуры. Праз супастаўленне несупастаўляльных прадметаў і парушэнне маштабаў імкнецца выявіць глыбокія філас. праблемы быцця. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1978.

ЧАРТО́ЎСКІ ВІР, Чартоў Вір, Ястрабельскае возера. У Столінскім р-не Брэсцкай вобл., у бас. р. Прыпяць, за 5 км на ПнУ ад в. Магільнае, за 25 км на ПнУ ад г. Столін. Пл. 0,26 км^2, даўж. 4,55 км, найб. шыр. 70 м, даўж. берагавой лініі 9,2 км. Катлавіна старычнага тыпу, вузкай стужкападобнай формы, выцягнутая з З на У.

ЧАРТЫ́, возера ў Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Паловіца, каля в. Чарты, за 8 км на ПнУ ад г. Паставы. Пл. 0,29 км^2, даўж. 1,18 км, найб. шыр. 380 м, даўж. берагавой лініі 2,8 км. Пл. вадазбору 4,75 км^2. Катлавіна выцягнутая з ПдЗ на ПнУ, яе схілы спадзістыя, выш. да 3 м, разараныя, на Пд пад хмызняком. Востраў пл. 0,5 га. Выцякае ручай у воз. Тусьба.

ЧАРТЫ́ЗМ (англ. chartism ад charter хартыя), масавы рэвалюцыйны рух англ. рабочых у 1830—50-я г. за паліт. правы, паляпшэнне свайго сац. і эканам. становішча. Назва ад т.зв. Нар. хартыі — апублікаванага рабочым-сталяром У.Ловетам праекта закона аб выбарчай рэформе з 6 пунктаў: права голасу ўсім мужчынам з 21 года; тайнае галасаванне; падзел Англіі на роўныя выбарчыя акругі з адным прадстаўніком у парламенце ад кожнай; штогадовыя выбары ў парламент; адсутнасць маёмаснага цэнзу пры допуску да выбараў у парламент; грашовае ўтрыманне для членаў парламента. У хартыі рабочыя ўбачылі сродак ліквідацыі паліт. панавання буйной буржуазіі і землеўладальнікаў. 4.2.1839 у Лондане адбыўся 1-ы кангрэс (канвент) чартыстаў. У 1840 у г. Манчэстэр створана Нац. чартысцкая асацыяцыя — 1-я ў гісторыі масавая рабочая партыя (каля 50 тыс. чал.). Палажэнні хартыі разам з інш. паліт. і сац.-эканам. патрабаваннямі ўключаны ў калект. петыцыі 1839 (1,2 млн. подпісаў), 1842 (3,5 млн. подпісаў) і 1848 (5 млн. подпісаў), якія былі пададзены ў парламент, але адхілены ім на падставе фармальных зачэпак. Падача петыцый суправаджалася масавымі выступленнямі рабочых і дробнай буржуазіі, якія часам пераходзілі ва ўзбр. сутыкненні з паліцыяй і войскамі. Унутры Ч. вяліся спрэчкі паміж прыхільнікамі мірных сродкаў барацьбы за хартыю («маральнай сілы»; Ловет) і абаронцамі рэв. метадаў барацьбы («фізічнай сілы»; Ф.О'Конар, Дж.О'Браен). У 1845 левыя чартысты разам з рэв. эмігрантамі шэрагу краін Еўропы стварылі ў Лондане міжнар. т-ва «Брацкія дэмакраты», лідэры яго левага крыла Дж.Гарні і Э.Джонс уступілі ў *Саюз камуністаў*. Чартысцкі друк апублікаваў англ. пераклад «Маніфеста Камуністычнай партыі» К.Маркса і Ф.Энгельса. Пасля 1848 Ч. пайшоў на спад. У 1851 чартысцкі Канвент прыняў праграму сацыяліст. пераўтварэння грамадства. У 1854 чартысты скліг

калі ў Манчэстэры Рабочы парламент, але масавай рабочай арг-цыі стварыць не здолелі. З ростам рэфармісцкіх тэндэнцый у рабочым руху (гл. *Рэфармізм*) Ч. сышоў з паліт. арэны Вялікабрытаніі.

Літ.: Рожков Б.А. Чартистское движение 1836—1954. М., 1960.

ЧА́РТЭР (англ. charter зафрахтаваць судна), дагавор паміж уладальнікам трансп. сродку і наймальнікам (фрахтавальнікам, адпраўшчыкам тавару) на арэнду трансп. сродку (напр., судна) або яго часткі на пэўны рэйс або тэрмін. Змяшчае найменні бакоў, звесткі пра трансп. сродак, памеры фрахту, месцы пагрузкі і выгрузкі, указанні пра сталійны час (тэрмін, за які груз павінен быць пагружаны на судна і выгружаны) і інш. Нормы аб Ч. ўтрымліваюцца ў цывільным заканадаўстве Рэспублікі Беларусь.

ЧАРЦЁЖ архітэктурны, відарыс будынкаў і збудаванняў, іх дэталей у арх. графіцы з захаваннем асобных правіл, маштабу і шэрагу ўмоўных адзнак; выкананне арх.-буд. чарцяжоў, якое грунтуецца на *нарысоўнай геаметрыі*. Падзяляецца на 3 віды: у артаганальных праекцыях (гл. *План, Разрэз, Фасад*), *перспектыве, аксанаметрыі*.

ЧАРЦЁЖНА-КАНСТРУ́КТАРСКАЯ ТЭ́ХНІКА, набор інструментаў, прылад і прыстасаванняў для выканання *чарцяжоў*, планаў, карт, схем. Асн. сродкі: чарцёжныя дошкі, станкі, прылады кардынатнай і пантографнай сістэмы, інструменты і дапаможныя прыстасаванні.

Чарцёжныя дошкі служаць для размяшчэння і замацавання чарцяжоў. Робяцца з драўняных матэрыялаў, пластмас, шкла; празрыстымі і з падсвечваннем, з маштабнымі сеткамі. Партатыўныя дошкі 350 × 500 мм, канструктарскія 1000 × 1350 мм. Чарцёжныя станкі забяспечваюць замацаванне і зручнае для работы становішча чарцёжных дошак пад любым вуглом, іх ураўнаважванне, апусканне, падыманне і паварочванне спец. прыстасаваннямі. Бываюць мала- і буйнагабарытныя, адна- і двухстоечныя, з падсвечваннем і без яго. Чарцёжныя прылады кардынатнага тыпу (кульманы) — прэцызійныя прыстасаванні з вугламернай галоўкай, лінейкамі і інш. для правядзення прамых ліній зададзенай даўжыні пад любым вуглом; пантографнага тыпу — сістэмы змацаваных паралелаграмаў з дзялільнай (вугламернай) галоўкай і ўзаемна перпендыкулярнымі маштабнымі лінейкамі для перачэрчвання чарцяжоў у зменены (звычайна больш дробным) маштабе (гл. *Пантограф*). Чарцёжны інструмент — *цыркулі, лінейкі* (у т.л. маштабныя, рэйсшыны, *лякалы*), *курвіметры, транспарціры*, чарцёжныя *трафарэты*, рэйсфедэры, вугольнікі і інш., з дапамогай якіх алоўкам або тушшу выконваюць чарцяжы. Набор асн. інструментаў у спец. футарале складае *гатавальню*. Выкарыстоўваюцца таксама *пішучыя машынкі* (для ўдрукоўвання ў чарцяжы стандартных абазначэнняў, літар, лічбаў), *графапабудавальнікі* і *прынтэры* (для аўтам. вычэрчвання і друкавання графічных відарысаў), *дысплеі* (для візуальнага адлюстравання графічнай і інш. інфармацыі). Пашыраецца выкарыстанне *персанальных ЭВМ*, для ўводу ў якія графічнай інфармацыі ўжываюць *сканеры* і *дыгітайзеры*.

У.М.Сацута.

ЧАРЭ́ЙСКАЕ ВО́ЗЕРА, Чарэя. У Чашніцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Лукомка, каля в. Чарэя, за 26 км на ПдУ ад г. Чашнікі. Пл. 3,38 км^2, даўж. 6,71 км, найб. шыр. 1,12 км, найб. глыб. 17 м, даўж. берагавой лініі 17,3 км. Пл. вадазбору 17 км^2. Катлавіна лагчыннага тыпу, выцягнута з Пн на Пд, складаецца з некалькіх плёсаў. Схілы катлавіны выш. да 10 м, на Пд да 18 м, участкамі на ПдУ і З паніжаюцца да 2 м, разараныя, часткова пад хмызняком. Берагі нізкія, пясчаныя, пад хмызняком, месцамі на Пн, ПнЗ і З зліваюцца са схіламі, абрывістыя, абразійныя, на Пд і ПдУ сплавінныя. Дно ў прыбярэжнай частцы выслана глінай, пясчанымі і пясчана-ілістымі адкладамі, глыбей — ілам. У цэнтры востраў пл. 0,02 км^2. Зарастае да глыб. 4 м, шыр. паласы прыбярэжнай расліннасці да 50 м. Злучана пратокай з азёрамі Галаўня і Чамярыца, упадаюць больш за 10 ручаёў і меліярац. каналаў, выцякае ручай у воз. Родамля.

ЧАРЭ́ЙСКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1924—31. Утвораны 17.7.1924 у Барысаўскай акрузе. Цэнтр — мяст. *Чарэя*. 20.8.1924 падзяляўся на 12 сельсаветаў. З 9.6.1927 па 26.7.1930 у Аршанскай акр. 8.7.1931 раён скасаваны. Сельсаветы перададзены ў Крупскі і Чашніцкі р-ны.

ЧАРЭ́МШЫЦА, гідралагічны заказнік рэсп. значэння на тэр. Мядзельскага р-на Мінскай вобл. Створаны ў 1981 для захавання балотнага масіву, які падтрымлівае водны баланс тэр. Нарачанскага прыроднага комплексу. З 2001 у складзе нац. парку *Нарачанскі*.

ЧАРЭ́НЦ (сапр. Сагаманян) Егішэ Абгаравіч (25.3.1897, г. Карс, Турцыя — 27.11.1937), армянскі пісьменнік. Вучыўся ў Маскве ва ун-тах Нар. імя А.Л.Шаняўскага (з 1916), працоўных Усходу (1921). З 1922 працаваў у друку. У 1937 рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны ў 1954. Друкаваўся з 1912. Першы паэт. зб. «Тры песні сумна-бледнай дзяўчыне...» (1914). У творах уплывы сімвалізму (паэмы «Блакітнавокая радзіма», «Вааган», абедзве 1915; цыкл «Лірычныя балады», 1915—17; зб. вершаў «Вясёлка», 1917), рэв. рамантызму з агітацыйна-прапагандысцкімі рысамі (паэмы «Сома», 1918; «Шалёныя натоўпы», 1919; «Усепаэма», 1921), эстэтыкі футурызму і канструктывізму (паэт. зб-кі «Раманс без кахання», «Паэзазурна», абодва 1922; сатыр. раман «Краіна Наіры», нап. 1921—24). У паэме «Хмбапет Шаварш» (1928), нарысе-ўспамінах «З Ерэванскага папраўчага дома» (1927), зб-ках вершаў «Эпічны світанак» (1930), «Кніга шляху» (1933) тэмы гіст. пераломму ў лёсе народа. На бел. мову яго асобныя творы пераклалі М.Дзелянкоўскі, М.Маляўка, Ю.Свірка, М.Танк.

Тв.: Рус. пер. — Стихотворения и поэмы. Л., 1973.

Літ.: Агабабян С. Е.Чаренц. М., 1982.

Д.Гаспаран.

ЧАРЭ́ШЛІ, Чарэшля, возера ў Навагрудскім р-не Гродзенскай вобл., у бас. р. Нёман, каля в. Чарэшля, за 24 км на Пн ад г. Навагрудак. Пл. 0,45 км^2, даўж. 1,2 км, найб. шыр. 450 м, даўж. берагавой лініі 2,9 км. Катлавіна авальнай формы, выцягнута з Пн на Пд, яе зах. схілы выш. да 3 м, спадзістыя, пад лугам, усх. — да 8 м, стромкія, параслі лесам. Праз возера цячэ р. Бярозка.

Чарэшня: 1 — агульны выгляд. Сарты: 2 — Мускатная; 3 — Залатая лошыцкая; 4 — Паўночная; 5 — Красуня; 6 — Дзенісена жоўтая; 7 — Народная.

ЧАРЭ́ШЛЯ, стаянкі каменнага веку каля в. Чарэшля Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. Стаянка-1 датуецца 3-м тыс. да н.э. Знойдзены крамянёвыя прылады, фрагменты керамікі *нёманскай культуры*. Стаянка-2 фінальнапалеалітычных і мезалітычных часоў. Знойдзены прылады з крэменю.

М.М.Чарняўскі.

ЧАРЭ́ШНЯ, вішня птушыная (Cerasus avium), кветкавая расліна сям. ружавых. Пашырана ў Зах. Еўропе, Зах. Азіі. Культывуецца ва ўмераным і субтрапічным паясах Паўн. паўшар'я з-за пладоў — сакаўных касцянак, што рана выспяваюць. Мае шмат сартоў. На Беларусі вырошчваецца на прысядзібных участках. У дзікаслым стане асобныя дрэвы трапляюцца ў паўд. раёнах краіны сярод хмызняку, уздоўж дарог.

Лістападнае дрэва выш. да 30 м, дыям. ствала да 60 см. Жыве да 100 гадоў і болей. Крона разрэджаная, шырокапірамідальная. Лісце чаргаванае, эліптычнае, бліскучае, пілаватае па краі. Кветкі белыя, у парасоніках, распускаюцца разам з лісцем. Плод — касцянка, у культ. форм белая, жоўтая, руковая, цёмна-чырв. ці амаль чорная. Мае цукры (11,5%), карацін, нікацінавую к-ту, жалеза. Спажываецца ў ежу, выкарыстоўваецца ў кансервавай прам-сці (лепшыя сярод кампотаў з костачкавых). У насенні 28% бялку, 30% алею, які выкарыстоўваецца ў парфумернай прам-сці. Драўніна лёгкая, мяккая, ідзе на такарныя і сталярныя вырабы. Харч., тэхн., дэкар. расліна.

ЧАРЭ́Я, вёска ў Чашніцкім р-не Віцебскай вобл., на паўд. беразе Чарэйскага воз., на скрыжаванні аўтадарог Чашнікі—Бобр і Халопенічы—Сянно. Цэнтр сельсавета. За 35 км на ПдУ ад г. Чашнікі, 130 км ад Віцебска, 20 км ад чыг. ст. Вятны. 597 ж., 250 двароў (2003). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Малітоўны дом евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік архітэктуры — Свята-Міхайлаўская царква (17 ст.).

На думку некат. даследчыкаў, у 14—15 ст. існавала Чарэйскае княства. Упершыню Ч. ўпамінаецца пад 1454 у актах Метрыкі ВКЛ, калі смаленскі епіскап Місаіл і яго брат Міхаіл Пструх заснавалі каля Ч. манастыр. У 1475 М.Пструх заснаваў тут Троіцкі храм, які перадаў пад патранат Багдану Сапегу. З 1495 уладанне Сапегаў. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) мяст. Ч. лічылася цэнтрам часткі Віцебскага ваяв., якая засталася ў ВКЛ. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) Ч. ў складзе Рас. імперыі, мястэчка, цэнтр воласці Сенненскага пав. Магілёўскага намесніцтва. Насельніцтва Ч. актыўна падтрымала паўстанне 1863—64. У 1863 тут адкрыта царк.-прыходская школа. У 1880 — 2112 ж., 200 дамоў, мураваная царква, касцёл, яўр. малітоўны дом. У пач. 20 ст. ў Ч. каля 3 тыс. ж., пач. вучылішча, 3 гарбарныя і піваварны з-ды. У 1919—24 у Віцебскай губ. У ліп. 1924 — ліп. 1931 цэнтр *Чарэйскага раёна* ў Барысаўскай, з 1927 у Аршанскай акругах, з 1931 у Чашніцкім р-не. У Вял. Айч. вайну ням. фашысты ў 1942 загубілі ў вёсцы 840 чал., у 1944 адправілі на работы ў Германію 97 чал. З 25.12.1962 да 6.1.1965 у Бешанковіцкім р-не.

Р.Л.Раманаў (гісторыя).

ЧАС у філасофіі, гл. *Прастора і час* у філасофіі.

ЧАС, форма існавання матэрыі, якая выражае паслядоўнасць змены станаў аб'ектаў, з'яў і працэсаў рэчаіснасці, працягласць іх існавання. Непарыўна звязаны з *рухам* матэрыі. Універсальныя ўласцівасці Ч. — працягласць, непаўтаральнасць, неабарачальнасць; фіз. тэорыя прасторы і Ч. — *адноснасці тэорыя* (гл. таксама *Прастора і час* у фізіцы).

Вымярэнне Ч. заснавана на назіранні перыядычна паўтаральных астр. і фіз. з'яў. Для злічэння вял. інтэрвалаў Ч. здаўна карыстаюцца працягласцю перыяду абарачэння Зямлі вакол Сонца (сідэрычны, або зорны *год*; трапічны, або *сонечны год* і інш.), Месяца вакол Зямлі (*сінадычны месяц, сідэрычны месяц*, трапічны і каляндарны *месяц*), Зямлі вакол уласнай восі (зорныя і сонечныя *суткі*). Гэтыя з'явы пакладзены ў аснову розных сістэм злічэння Ч. — *календароў*. Асн. адзінкі Ч. ў астраноміі — трапічны год (роўны 365,2422 сут) і *зорныя суткі*. Сутачнае вярчэнне Зямлі вакол сваёй восі адносна нерухомых зорак вызначае *зорны час* (24 зорныя гадзіны, роўныя 23 гадз 56 мін 4,091 с сярэдняга сонечнага Ч.). На практыцы карыстаюцца сонечным Ч., які вызначаецца па змене гадзіннага вугла Сонца. Ён бывае сапраўдны і сярэдні (у залежнасці ад таго, па сапраўдным ці сярэднім Сонцы робіцца адлік Ч.). Рознасць паміж сярэднім і сапраўдным сонечным Ч. наз. *ўраўненнем часу*. У 1950 уведзены раўнамерны *эфемерыдны час*, звязаны з трапічным годам. Кульмінацыі Сонца і пункта веснавога *раўнадзенства*, па якіх вызначаюцца сонечныя і зорныя суткі, на розных мерыдыянах адбываюцца неадначасова. Так вызначаны для зададзенай даўгаты Ч. наз. *мясцовым часам*. Мясцовы сярэдні сонечны Ч. *Грынвіцкага мерыдыяна* наз. *сусветным часам*. Для зручнасці ў большасці краін прынята сістэма *паяснога часу*. Ч. нулявога пояса наз. заходнееўрапейскім або сусветным, 1-га пояса — сярэднееўрапейскім, 2-га — усходнееўрапейскім. У Расіі Ч. 2-га гадзіннага пояса наз. маскоўскім. З улікам *дэкрэтнага часу* (у СССР уведзены ў чэрвені 1930, адменены ў лютым 1991, адноўлены ў Расіі ў кастр. 1991) маскоўскі Ч. апераджае сусветны на 3 гадз. Тэр. Беларусі ўваходзіць у 2-і пояс, таму беларускі Ч. ідзе на 2 гадз раней за сусветны і на 1 гадз пазней за маскоўскі. У шэрагу краін, у т.л. на Беларусі, на летні перыяд уводзяць летні час, які апераджае паясны на 1 гадз. Для гэтага ў апошнюю нядзелю сакавіка паказанні гадзіннікаў пераводзяць на 1 гадз уперад, у кастрычніку — на 1 гадз назад.

Для адліку больш дробных інтэрвалаў Ч. суткі здаўна дзялілі на *гадзіны* (светлую іх частку — на 12 дзённых гадзін, цёмную — на 12 начных, розных па працягласці). Пазней уведзены падзел сутак на 24 роўныя гадзіны, гадзін — на *мінуты*. Асн. адзінка Ч. ў Міжнар. сістэме адзінак (СІ) — *секунда*. Перыяд Ч. *тыдзень* — адвольны, роўны 7 сут (прыблізна адпавядае чвэрці сінадычнага месяца), штучна ўтвораны ў краінах Стараж. Усходу на рэлігійна-астралаг. аснове.

У глыбокай старажытнасці не існавала ні храналагічнай *эры* як пэўнай сістэмы адліку гадоў, ні *эпохі* як яе пачатковага пункта. Адлік гадоў вялі па датах значных падзей ці праўленняў цароў, для чаго вялі іх спісы. У некат. выпадках падзеі прывязвалі да астр. з'яў (напр., сонечных зацьменняў), што дазваляе больш дакладна датаваць падзеі стараж. гісторыі. Падлік Ч. (летазлічэнне) пачаўся з развіццём жывёлагадоўлі, земляробства, мараплаўства. Качавыя народы, якія займаліся жывёлагадоўляй, карысталіся месяцавымі календарамі, у якіх працягласць абарачэння Месяца вакол Зямлі звязвалася са зменай фаз Месяца. З пераходам да земляробства часцей карысталіся сонечнымі календарамі, у якіх прыблізна ўзгадняліся суткі і год, а таксама месяцава-сонечнымі, у якіх рух Сонца ўзгадняўся са зменай фаз Месяца. Месяцавым календаром пачалі карыстацца ў цывілізацыях Месапатаміі, Стараж. Егіпце, Кітаі. У 3-м тыс. да н.э. ў Стараж. Егіпце ён заменены на сонечны, у 6 ст. да н.э. ў Кітаі — на месяцава-сонечны. Іудзейскі месяцавы каляндар набыў пашырэнне з 9 ст. да н.э., у 4 ст. да н.э. ён заменены на месяцава-сонечны. У 593 да н.э. ў Афінах Салон увёў каляндар вавілонскага тыпу, у якім было 5 звычайных гадоў па 12 мес і 3 падоўжаныя гады па 13 мес. У 432 да н.э. астраном Метон устанавіў, што ў 19 сонечных гадах змяшчаецца 235 сінадычных месяцаў і што праз гэты перыяд розныя фазы Месяца зноў адбываюцца ў тыя ж дні сонечнага года. У выніку месяцава-сонечны каляндар грэкаў быў удакладнены. Летазлічэнне ў Стараж. Грэцыі вялі па гадах праўлення архонтаў-эпонімаў і па алімпіядах, што рэгулярна праводзіліся 1 раз у 4 гады (1-я алімпіяда адбылася ў 776 да н.э.); у Стараж. Рыме — ад даты заснавання Рыма (753 да н.э.). У пач. 6 ст. да н.э. рымляне перайшлі ад месяцавага да месяцава-сонечнага календара, у 46 г. да н.э. ўвялі сонечны юліянскі каляндар (*стары стыль*; распрацаваны александрыйскімі астраномамі на чале з Сазігенам, адлік па ім пачаўся з 1 студзеня 45 г. да н.э.). У 2 ст. н.э. К.*Пталамей* увязаў грэка-рымскую храналогію з вавілонскай. У 525 італьян. манах Дыянісій Малы распрацаваў новае летазлічэнне — ад дня нараджэння *Хрыста* (25 снеж. 753 г. ад заснавання Рыма), якое з 532 пачало выкарыстоўвацца ў Рыме, з 8 ст. ў Францыі і інш. краінах. У сярэдневяковай гэтае злічэнне суіснавала з раней прынятымі ў розных краінах злічэннямі «ад стварэння свету». На аснове біблейскіх паданняў правасл. царква ў 7 ст. прыняла за дату адліку 5508 г. да н.э. (візантыйская эра), англіканская — 4004 г. да н.э., іудзейская — 3761 г. да н.э. Пераход на злічэнне «ад нараджэння Хрыстова» (на юліянскі каляндар) у Расіі ажыццявіў Пётр I (замест 1 студз. 7208 г. візантыйскай эры ўведзена 1 студз. 1700 г.). Больш дакладны грыгарыянскі каляндар (*новы стыль*), прыняты ў 1582 (выдадзена спец. була рымскага папы Грыгорыя XIII). На яго перайшла большасць каталіцкіх краін, з пач. 18 ст. — пратэстанцкія, у 1752 Вялікабрытанія, у 1918 Расія (пасля 31 студзеня лічылася не 1, а 14 лютага). Да сярэдзіны 20 ст. грыгарыянскім календаром пачала карыстацца большасць краін свету. Для пераводу юліянскіх дат на новы стыль дадаюцца папраўкі (у сутках): з 5 кастрычніка 1582 па 29 лютага 1700 — 10, з 1 сакавіка 1700 па 29 лютага 1800 — 11, з 1 сакавіка 1800 па 29 лютага 1900 — 12, з 1 сакавіка 1900 па 29 лютага 2100 — 13. У краінах ісламу выкарыстоўваецца месяцавы мусульманскі каляндар, за пачатак якога прыняты 622 г. — год хіджры (перасялення *Мухамеда* з Меккі ў Медыну). Існуюць таксама будыйская эра (яе пачатак ад 950 г. да н.э.), кітайская цыклавая эра (ад 2637 г. да н.э.), індыйская каліюга — «жалезнага веку» (ад 3102 г. да н.э.) і інш.

На бел. землях сістэма злічэння Ч. па юліянскім календары выкарыстоўвалася з 13 ст. У 1582 ВКЛ перайшло на зах.-еўрап. грыгарыянскі каляндар. Пасля далучэння Беларусі да Рас. імперыі зноў уведзены (з 1800) юліянскі каляндар (больш падрабязна гл. ў арт. *Храналогія*).

Першай прыладай вымярэння Ч. (з 3500 г. да н.э.) быў *сонечны гадзіннік*. Па *гномонах* вызначалі Ч. дня і пары года. Прамежкі Ч. вымяралі вадзянымі, агнявымі і *пясочнымі гадзіннікамі*. З 14 ст. ў Еўропе пашырыліся мех. *гадзіннікі* з гірамі, з 16 ст. — спружынныя, з 17 ст. — маятнікавыя, з 1840 — з эл. батарэямі (удасканалены ў 1906). У 1929 з'явіліся першыя *кварцавыя гадзіннікі*, у 1948 — *квантавыя гадзіннікі*. Прыладамі-лічыльнікамі Ч. з'яўляюцца таксама *хранометры, секундамеры, таймеры, рэле часу* і камбінаваныя прылады. Вызначэннем і захоўваннем дакладнага Ч. займаецца *служба часу*.

Літ.: Константинов А.И., Флеер А.Г. Время. М., 1971; Селешников С.И. История календаря и хронология. 3 изд. М., 1977; Время и частота: Пер. с англ. М., 1973; Пипуныров В.Н. История часов с древнейших времен до наших дней. М., 1982; Буткевич А.В., Зеликсон М.С. Вечные календари. 2 изд. М., 1984; Завельский Ф.С. Время и его измерение. 5 изд. М., 1987; Климишин И.А. Календарь и хронология. 3 изд. М., 1990.

А.І.Болсун, У.М.Сацута.

ЧАС ВЫТВО́РЧАСЦІ, час, які ахоплівае ўвесь працэс вырабу якога-н. тавару на прадпрыемстве ад паступлення прылад і прадметаў працы ў сферу вытв-сці да выпуску прадукцыі. Асн. частку Ч.в. складае рабочы перыяд. Уключае перапынкі ў працэсе працы (выхадныя дні, абедзенныя перапынкі і начныя часы), час знаходжання сыравіны, паліва, дапаможных матэрыялаў на складах прадпрыемства ў форме вытв. запасаў.

ЧАС ДЗЕЯСЛО́ВА, словазменная катэгорыя, якая абазначае адносіны дзеяння да моманту размовы. У сучаснай бел. мове адрозніваюць 3 формы Ч.дз.: цяперашні, прошлы і будучы. Формы цяперашняга і будучага часу складаюць групу няпрошлых часоў, якая проціпастаўлена формам прошлага часу. Катэгорыя часу ўласціва толькі формам абвеснага ладу. Ч.дз. цесна звязаны з *трыванне дзеяслова*: дзеясловы незакончанага трывання маюць поўную парадыгму часавых форм (цяперашні, прошлы і будучы), дзеясловы закончанага трывання — толькі прошлы і будучы: «бегчы — бягу, бег, буду бегчы», «адбегчы — адбег, адбягу».

Цяперашні час абазначае дзеянне, якое адбываецца ў момант гутаркі, утвараецца ад асноў інфінітыва незакончанага трывання з дапамогай асабовых канчаткаў («чытаю — чытаеш — чытае — чытаем — чытаеце — чытаюць»). Прошлы час абазначае дзеянне, якое адбывалася ці адбылося да моманту гутаркі, утвараецца ад асноў інфінітыва закончанага ці незакончанага трывання з дапамогай суфікса «-л-(-ў)» і канчаткаў «-а», «-о», «-і» («чытаў — чытала — чыталі», «прыйшоў — прыйшла — прыйшло — прыйшлі») і мае 2 формы: простую, найб. пашыраную («нёс — несла — неслі»), і складаную, якая абазначае даўно мінулае дзеянне і ўтвараецца спалучэннем звязкі «быць» і дзеяслова ў прошлым часе («якраз тады прыехалі былі з горада сябры», «я быў нагледзеў харошы дубок»). Будучы час абазначае дзеянне, якое адбудзецца ці будзе адбывацца пасля моманту гутаркі. Мае 2 формы: простую, якая ўтвараецца ад асноў інфінітыва закончанага трывання пры дапамозе асабовых канчаткаў («прачытаю — прачытаеш — прачытае — прачытаем — прачытаеце — прачытаюць»), і складаную, якая ўтвараецца са звязкі «быць» і інфінітыва («буду чытаць», «будзем чытаць»).

У сістэме часоў дзеясловаў бел. мовы адбыліся прыкметныя змены. У агульнаўсх.-слав. мове адрозніваліся 7 форм часу. Зніклі формы прошлага часу *аорыст, імперфект*, а на аснове *перфекта* і імперфекта ўтварыліся сучасныя формы прошлага часу. Простая форма будучага часу захавалася. Складаныя формы, утвораныя спалучэннем інфінітыва і дапаможных дзеясловаў «начыну», «пачыну», «хачу», а таксама далучэннем дапаможнага дзеяслова «буду» да дзеепрыметніка на «-ль» («буду робіль»), перасталі ўжывацца. Замацавалася форма будучага складанага часу з дапаможным дзеясловам «буду» і інфінітывам. На аснове даўнейшай складанай формы з дапаможным дзеясловам «іму» («іму робити», «іму носити») утварыліся дзеясловы тыпу «рабіцьму», «насіцьму», пашыраныя ў паўд. бел. гаворках.

Літ.: Шуба П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія. Мн., 1987; Янкоўскі Ф.М. Гістарычная граматыка беларускай мовы. 3 выд. Мн., 1989.

Я.М.Адамовіч.

ЧАСА́ННЕ валакністых матэрыялаў, раздзяленне касмылькоў валокнаў (бавоўны, воўны, лёну і інш.) на асобныя валокны, выдаленне смецця і інш. заган, злучэнне валокнаў у стужку ці ў *роўніцу*; адзін з асн. працэсаў падрыхтоўкі да *прадзення*. Выконваецца пасля *трапання*. Ч. робяць ігольчастымі паверхнямі рабочых органаў часальных машын. Ч. часам называюць і прачэсванне валакна грэбенем (гл. *Грэбенечасальная машына*).

ЧАСЛА́ЎСКА (Časlavská) Вера (н. 3.5.1942, Прага), чэшская спартсменка (спарт. гімнастыка). Абс. чэмпіёнка XVIII і XIX Алімп. гульняў (1964, Токіо — 3 залатыя медалі: мнагабор'е, апорны скачок, практыкаванні на бервяне; сярэбраны прызёр у камандным заліку; 1968, Мехіка — 4 залатыя медалі: мнагабор'е, вольныя практыкаванні, апорны скачок, практыкаванні на брусах; сярэбраны прызёр у практыкаваннях на бервяне і ў камандным заліку); сярэбраны прызёр XVII Алімп. гульняў (1960, Рым). Абс. чэмпіёнка свету (1966), чэмпіёнка свету 1962 у апорным скачку, 1966 у апорным скачку і ў камандным заліку. Абс. чэмпіёнка Еўропы (1965, 1967). Чэмпіёнка Еўропы (1959) у практыкаваннях на бервяне і сярэбраны прызёр у апорным скачку; бронз. прызёр (1961) у мнагабор'і і вольных практыкаваннях.

А.М.Петрыкаў.

ЧАСНО́К (Allium sativum), кветкавая расліна сям. цыбулевых. Радзіма — Паўд. Азія. У культуры вядомы за некалькі тысячагоддзяў да н.э., вырошчваўся ў стараж. Егіпце, Грэцыі, Рыме. Культывуюць, у т.л. на Беларусі, сарты Ч. стрэлкавага і нястрэлкавага, ці звычайнага, у азімай і яравой формах.

Травяністая цыбульная расліна з укарочаным сцяблом. На ніжняй ч. донца цыбуліны ўтвараюцца прыдаткавыя карані. Лісце лінейнае, плоскае або з жалабком, прамастойнае ці паніклае. Кветаноснае сцябло (стрэлка) выш. 60—150 см. У суквецці фарміруюцца

Часнок: 1 — стрэлкавы азімы 2-га года жыцця; 2 — стрэлка (кветанос); 3, 4 — суквецці; 5 — бульбачка; 6 — зубок; 7, 8 — цыбуліны азімага стрэлкавага 2-га года; 9 — цыбуліны нястрэлкавага часнаку.

паветраныя цыбулінкі (культ. формы насенне не ўтвараюць). Сарты Ч. адрозніваюцца афарбоўкай, колькасцю (2—50) і велічынёй дробных цыбулін, т.зв. зубкоў. Размнажаюць зубкамі або цыбулінкамі. У зубках 6—7,9% бялкоў, 7—28 мг% вітаміну С (у лісці — да 80 мг%), 20—27% поліцукрыдаў, фітанцыды. Спецыфічны смак і пах абумоўлены эфірным алеем. Лісце і зубкі спажываюцца ў ежу; выкарыстоўваюць у кансервавай прам-сці, кулінарыі, медыцыне і ветэрынарыі. Харч., лек., тэхн. расліна.

Часночніца чаранковая.

ЧАСНО́ЧНІЦА (Alliaria), род кветкавых раслін сям. крыжакветных. 5 відаў. Пашыраны ў Еўразіі. На Беларусі 1 від — Ч. чаранковая, або лекавая (A. petiolata). Трапляецца ў вільготных месцах, у лясах, сярод хмызняку, у агародах, па ярах.

Ч. чаранковая — двухгадовая травяністая расліна выш. 20—100 см з пахам *часнаку*. Сцёблы адзіночныя, простыя або галінастыя, унізе апушаныя. Ніжняе лісце доўгачаранковае, ныркападобнае, выемчата-гародчатае, сярэдняе — сэрцападобнае, верхняе — сядзячае, трохвугольнае, зубчастае. Кветкі белыя, у гронках. Плод — стручок. Ч. чаранковая спажываецца як прыправа (замест часнаку); лісце мае вітамін С, насенне — да 30% алею. Харч., лек. расліна.

ЧАСНО́ЧНІЦЫ (Pelobatidae), сямейства бясхвостых земнаводных. 12 родаў, каля 60 відаў. Пашыраны пераважна ў Зах. і Паўд.-Усх. Азіі, таксама ў Еўропе, Паўн.-Зах. Афрыцы, Паўн. і Цэнтр. Амерыцы. Жывуць у стэпах, лясах, на лугах, палях і інш. Найб. вядомыя Ч.: звычайная (Pelobates fuscus), сірыйская (P. syriacus), крыжоўкі (Pelodytes). Падвід Ч. звычайнай — у Чырв. кнізе МСАП. На Беларусі трапляецца Ч. звычайная.

Даўж. да 10 см. Цела шчыльнае, вонкава Ч. падобныя да жаб і рапух. Скура гладкая або злёгку гузаватая. Грудны пояс рухомы. Зрэнка вертыкальная. Ва ўласна Ч. на задніх нагах пятачныя бугаркі (для рыцця) і плавальныя перапонкі паміж пальцамі. Ч. звычайная пераважна вясной мае слабы часночны пах (адсюль назва). Кормяцца беспазваночнымі.

1 2 3

Часночніцы: 1 — звычайная; 2 — сірыйская; 3 — крыжоўка каўказская.

Часночны грыб.

ЧАСНО́ЧНЫ ГРЫБ, часночнік (Marasmius scorodonius), шапкавы базідыяльны грыб сям. радоўкавых. Пашыраны ў Паўн. паўшар'і. На Беларусі трапляецца ў лісцевых і хвойных лясах з ліп. па верасень.

Шапка дыям. да 3 см, пукатая, потым плоскараспасцёртая, крэмава-бураватая да белай, гладкая, сухая, тонкамясістая. Пласцінкі белыя, частыя, прыросшыя. Ножка выш. да 5 см, храсткаватая, рыжавата-карычневая, бліскучая. Грыб мае часночны пах і смак, які захоўваецца і ў высушаным выглядзе. Ядомы, спажываецца як прыправа.

ЧА́СНЫК Мікалай Лявонцьевіч (н. 26.10.1921, г. Орша Віцебскай вобл.), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Барысаглебскую школу ваен. лётчыкаў (1941), Ваенна-паветр. акадэмію (1952). У Вял. Айч. вайну з 1941 на Паўн.-Зах. фронце: лётчык-знішчальнік. Камандзір ны пах (адсюль назва). Кормяцца беспазваночнымі.

звяна палка асобага прызначэння ст. лейт. Ч. да крас. 1944 зрабіў 685 баявых вылетаў, у 39 паветр. баях збіў 16 і ў складзе групы 3 самалёты праціўніка. 7.7.1944 збіты ў баі, трапіў у палон; удзельнік паўстання вязняў у канцлагеры Бухенвальд. Да 1958 у ВПС Сав. Арміі, потым у грамадз. авіяцыі.

ЧАСОВААБАВЯ́ЗАНЫЯ СЯЛЯ́НЕ, катэгорыя былых прыватнаўласніцкіх (панскіх) сялян Рас. імперыі, вызваленых ад прыгоннай залежнасці паводле *«Палажэнняў» 19 лютага 1861*, але не пераведзеных на выкуп (гл. *Выкупная аперацыя*). Тэрмін часоваабавязаных адносін дакладна не вызначаўся, іх спыненне цалкам залежала ад волі памешчыка. За карыстанне зямлёй Ч.с. выконвалі *аброк* або *паншчыну*. Пад уплывам *паўстання 1863—64* і масавага руху сялян супраць грабежніцкіх умоў *сялянскай рэформы 1861* царскі ўрад законам ад 13.3.1863 увёў абавязковы выкуп сял. надзелаў у Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай губ., у латгальскіх і Дрысенскім пав. Віцебскай губ. Тут Ч.с. з 13.5.1863 пераводзіліся ў разрад т. зв. сялян-уласнікаў. 14.11.1863 дзеянне гэтага ўказа пашырана на ўсю Віцебскую і Магілёўскую губ., дзе абавязаныя адносіны спынены 13.1.1864. Выкупныя плацяжы ва ўсіх 6 названых зах. губернях павінны былі знізіцца на 20%, рэальна гэтае зніжэнне было больш значным. Катэгорыя Ч.с. у Рас. імперыі скасавана законам ад 9.1.1882, згодна з якім усе б. панскія сяляне з пач. 1883 пераводзіліся на абавязковы выкуп. *В.П.Панюціч.*

ЧАСО́ВАЕ БЕЛАРУ́СКАЕ БЮРО́ ЦК РКП(б), часовы кіруючы орган Кампартыі Беларусі. Створана паводле рашэння Прэзідыума ЦК РКП(б) ад 4.2.1924 для правядзення арганізац. і

М.Л.Часнык.

паліт. мерапрыемстваў, звязаных з вяртаннем у склад БССР усх.-бел. тэрыторый. Выконвала функцыі *Цэнтральнага Бюро КП(б)Б* [ЦБ КП(б)Б]. Дзейнічала да 12.5.1924. Яго паўнамоцтвы распаўсюджваліся на тэр. пашыранай БССР, і гал. задачай было прадухіленне канфліктаў, якія ўзнікалі ў ходзе *ўзбуйнення БССР* паміж кіраўніцтвам рэспублікі і парт. арг-цыямі губерняў. У склад Ч.Б.Б. ўвайшлі прадстаўнік ЦК РКП(б) і сакратар Ч.Б.Б. А.М.Асаткін-Уладзімірскі, 5 прадстаўнікоў ад ЦБ КП(б)Б (Я.А.Адамовіч, В.А.Багуцкі, В.А.Нодэль, Ш.Ш.Ходаш, А.Р.Чарвякоў), 4 — ад Віцебскай губ. (В.У.Дзякаў, Э.М.Мендэ, Дз.Ф.Прышчэпаў, В.П.Трунтаеў), 2 — ад Гомельскай губ. (Ф.А.Браўковіч, А.Б.Рыскін), 1 — ад Смаленскай губ. (Г.Л.Брандбург, з 4.5.1924 М.М.Галадзед). Для апаратыўнага кіраўніцтва справамі быў створаны і дзейнічаў Прэзідыум Ч.Б.Б. ЦК РКП (б). Структурна Ч.Б.Б. ўключала аддзелы: арганізац.-інструктарскі, агітац.-прапагандысцкі, Польскае Бюро, Гал. Бюро яўр. секцый, аддзел работніц і сялянак.

Кр.: Отчет Временного Белорусского Бюро ЦК РКП(б): (за время февраль—май 1924 г.). Мн., 1924. *С.М.Хоміч.*

ЧАСО́ВЫ БЕЛАРУ́СКІ НАЦЫЯНА́ЛЬНЫ КАМІТЭ́Т (ЧБНК), бел. грамадска-паліт. арг-цыя, каардынац. орган бел. нац. руху ў час польска-сав. вайны 1919—20. Створаны 10.8.1919 у Мінску. У яго ўвайшлі прадстаўнікі партый бел. эсэраў, сацыял-дэмакратаў, сацыял-федэралістаў, Бел. хрысціянска-дэмакр. злучнасці, а таксама Бел. вайсковай камісіі, Бел. правасл. нар. брацтва імя святых Кірылы і Лаўрэнція Тураўскіх, культ.-асв. арг-цый, навуч. устаноў і кааператы ваў. 12.8.1919 абраны прэзідыум: А.Прушынскі (*А.Гарун*, старшыня, з 17.10.1919 — К.*Цярэшчанка*), У.*Ігнатоўскі* (нам. старшыні), А.*Аўсяннік* (сакратар), Я.*Фарботка* (пісар), Я.Луцэвіч-

Іваноўская; ганаровым членам к-та выбраны Я.Купала. ЧБНК праводзіў актыўную дзейнасць па арганізацыі бел. школьніцтва, кнігавыданні, стварэнні нац. культ.-асв. устаноў і маладзёжных гурткоў, па беларусізацыі навуч. устаноў, царк. і касцельнага богаслужэння, па развіцці бел. прэсы. Існаваў за кошт грашовых укладаў рэгіянальных бел. арг-цый, добраахвотных калектыўных і прыватных ахвяраванняў. З-за недахопу фінансаў увага аддавалася арганізацыі бел. каап. і прадпрымальніцкіх гасп. структур. Ва ўмовах, калі ўрад БНР знаходзіўся ў эміграцыі і Рада БНР не функцыянавала, а дзейнасць Цэнтр. бел. рады Віленшчыны і Гродзеншчыны была паралізавана рэпрэсіямі з боку акупац. улад Польшчы, ЧБНК стаў гал. каардынац. цэнтрам бел. нац. руху на акупіраванай тэр. Беларусі. Пры к-це існавалі школьная секцыя на чале з С.Рак-Міхайлоўскім (30.8.1919 рэарганізавана ў Мінскую бел. школьную раду), с.-г. аддзел (са студз. 1920 Бел. цэнтр. саюз сельскай гаспадаркі), арганізац.-інструктарскі аддзел (кіраўнік Я.Трафімаў), выдавецкі аддзел (С.Некрашэвіч), аддзел дапамогі бедным дзецям (Луцэвіч-Іваноўская); для арганізацыі Бел. нац. тэатра ўтворана тэатр. камісія (Ч.Родзевіч). К-т фундаваў выданне газет *«Звон»*, *«Беларусь»*, «Наша каліна», час. *«Рунь»*. Пры ЧБНК існаваў ін-т інструктараў (рэзідэнтаў) па нац.-культ. і каап. справах (больш за 30 чал.), у выніку дзейнасці якога створаны бел. нац. к-ты ў Бабруйску, Ігумене, Слуцку і інш., Бел. рада ў Баранавічах, адкрыты бел. школы, с.-г. і спажывецкія т-вы, культ.-асв. арг-цыі. ЧБНК выступаў у абарону арыштаваных бел. нац. дзеячаў, супраць закрыцця бел. навуч. устаноў, узяў пад свой загад б. Мінскую земскую друкарню, намагаўся праз перавыбары кіраўніцтва падпарадкаваць свайму ўплыву Бел. цэнтр. саюз спажывецкіх т-ваў, стварыць спарт. аддзел, Бел. нар. банк. 10.7.1920 абраны новы склад прэзідыума, у які акрамя старшыні Цярэшчанкі ўвайшлі А.Смоліч (нам. старшыні), А.Крэпскі, М.Кудзелька (М.Чарот), А.Шатэрнік, А.Неканда-Трэпка. Дзейнасць к-та адбывалася пад уплывам бел. эсэраў і БКА, якія выкарыстоўвалі яго легальны статус для антыпольск. прапаганды і падп. работы. Пасля расколу Рады БНР у снеж. 1919 большасць членаў ЧБНК падтрымала ўрад В.Ластоўскага. Інструктары к-та праводзілі сярод сялянства агітацыю супраць палітыкі польскіх акупантаў, былі сувязнымі з прыфрантавымі часцямі Чырв. Арміі, арганізоўвалі партыз. атрады. ЧБНК некалькі разоў дамагаўся ад кіраўніцтва Грамадзянскага ўпраўлення ўсх. зямель стварэння бел. прадстаўнічых краёвых і рэгіянальных органаў улады. З пачаткам мірных перагавораў паміж Польшчай і Сав. Расіяй у сак. 1920 ЧБНК прыняў рэзалюцыю, у якой канстатаваў недапушчэнне і незаконнасць прыняцця ваюючымі бакамі дыскрымінац. рашэнняў, якія закранаюць інтарэсы бел. народа і пагражаюць цэласнасці Беларусі, пацвярджалася вернасць палажэнням *Трэцяй устаўнай граматы* БНР. Спыніў сваю дзейнасць у ліп. 1920 з прыходам у Мінск Чырв. Арміі.

Літ.: Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. Ч. 2. Гомель, 1993; Л я х о ў с к і У. Беларуская справа падчас польскай акупацыі // Спадчына. 1994. № 6. *У.В.Ляхоўскі.*

ЧАСО́ВЫ КАМІТЭ́Т ДЗЯРЖА́ЎНАЙ ДУ́МЫ 1917, Часовы камітэт членаў Дзяржаўнай думы, часовы орган улады ў Расіі ў час *Лютаўскай рэвалюцыі 1917*. Створаны 27.2(12.3).1917 у Петраградзе дэпутатамі большасці фракцый 4-й *Дзяржаўнай думы*. Старшыня — акцябрыст М.У.*Радзянка*. Камітэт абвясціў, што бярэ на сябе кіраванне краінай, накіраваў сваіх камісараў у міністэрствы, стварыў ваен., харч. і інш. камісіі. 1(14).3.1917 яго прызналі дэ-факта ўрады Вялікабрытаніі і Францыі. Камітэт накіраваў да імператара *Мікалая II* сваіх прадстаўнікоў А.І.*Гучкова* і В.В.*Шульгіна*, якія схілілі яго адрачыся ад прастола на карысць брата Міхаіла (таксама адмовіўся ад улады); 2(15).3.1917 па дамоўленасці з кіраўніцтвам Петраградскага савета стварыў *Часовы ўрад*, куды ўключыў многіх сваіх членаў. У далейшым дзейнічаў як прадстаўнічы орган Думы, ліквідаваны пасля яе афіц. роспуску [6(19).9.1917].

ЧАСО́ВЫ НАЦЫЯНА́ЛЬНЫ ЎРАД У ВАРША́ВЕ, гл. *Цэнтральны нацыянальны камітэт у Варшаве.*

ЧАСО́ВЫ ПАВЕ́РАНЫ Ў СПРА́ВАХ, асоба, якая часова выконвае абавязкі кіраўніка дыпламат. прадстаўніцтва. Міжнар.-прававое вызначэнне яго статуса дадзена ў Венскай канвенцыі аб дыпламат. зносінах (1961). Назначаецца, калі пасада кіраўніка прадстаўніцтва вакантная або калі кіраўнік не ў стане выконваць свае функцыі. Карыстаецца правамі і прывілеямі кіраўніка дыпламат. прадстаўніцтва (за выключэннем некат. пратакольных ушанаванняў).

ЧАСО́ВЫ ПАЛЯВЫ́ АЎДЫТАРЫЯ́Т (ЧПА), карны орган пры штабе войск Віленскай ваен. акругі, які выносіў прысуды ўдзельнікам *паўстання 1863—64* на Беларусі і ў Літве. Дзейнічаў у Вільні з 12.10.1863 да 25.8.1867. Разглядаў судова-следчыя справы ўдзельнікаў паўстання на тэр. Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай і Аўгустоўскай губ., зацвярджаў прыгаворы ваенна-палявых судоў, прадстаўленні мясц. органаў. Архівы ЧПА захоўваецца ў Дзярж. гіст. архіве Літвы і з'яўляецца каштоўнай крыніцай па гісторыі паўстання і тагачаснага грамадска-паліт. жыцця. Уключае справы К.Каліноўскага і яго паплечнікаў, Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Навагрудскай і інш. рэв. арг-цый, нелегальных т-ваў «Бібліятэка ашмянскай моладзі» і «Пянтковічаў», матэрыялы пра распаўсюджванне газ. *«Мужыцкая праўда»*, склад і дзейянні паўстанцкіх атрадаў, барацьбу розных плыней у вызв. руху, удзел у паўстанні бел. пісьменнікаў В.Дуніна-Марцінкевіча, Ф.Багушэвіча, А.Вярыгі-Дарэўскага, Я.Вуля і інш.

Літ.: О б у ш е н к о в а Л.А. Архивные материалы судебно-следственных учреждений 1863—1866 гг. по делам участников восстания // К столетию героической борьбы «за нашу и вашу свободу». М., 1964; Пачыльнікі: З гіст.-літ. матэрыялаў XIX ст. Мн., 1977; Rok 1863: Wyroki śmierci. Wilno, 1923.

Г.В.Кісялёў.

ЧАСО́ВЫ ПРАВІНЦЫЯ́ЛЬНЫ ЎРАД ЛІТВЫ́ І БЕЛАРУ́СІ, цэнтр падрыхтоўкі і кіраўніцтва *паўстаннем 1863—64* на Беларусі і ў Літве. Створаны ў Вільні 1.2.1863 на базе *Літоўскага правінцыяльнага камітэта*, які абвясціў сябе Часовым урадам на чале з К.Каліноўскім. У сувязі з пачаткам паўстання ў Польшчы ўрад у кожную губерню прызначыў паўстанцкага ваен. начальніка і ўзяў курс на разгортванне паўстання з апорай на сялянства. «Белыя», незадаволеныя курсам Каліноўскага на агр. рэвалюцыю, у канцы лют. 1863 увайшлі ў змову з прадстаўніком Варшаўскага Цэнтр. нац. к-та пры Часовым урадзе Літвы і Беларусі Н.Дзюлёранам і ўчынілі пераварот. Часовы ўрад, аслаблены арыштамі і ад'ездам яго членаў на месцы, вымушаны быў 11.3.1863 перадаць уладу *Аддзелу кіраўніцтва правінцыямі Літвы*. *Г.В.Кісялёў.*

ЧАСО́ВЫ РАБО́ТНІК, асоба, прынятая на работу на пэўны тэрмін. Тэрмін не павінен перавышаць 2 мес, а для замяшчэння часова адсутных работнікаў, за якімі захоўваецца іх месца работы, — да 4 мес. Адрозніваюць Ч.р. і сезонных, што прыняты на пэўны сезон года, які не перавышае 6 мес (напр., перапрацоўка агародніны і садавіны).

ЧАСО́ВЫ РАБО́ЧА-СЯЛЯ́НСКІ САВЕ́ЦКІ ЎРА́Д БЕЛАРУ́СІ, вышэйшы орган дзярж. улады БССР з 1.1 да 2.2.1919. Сфарміраваўся ў ходзе нац.-дзярж. самавызначэння Беларусі ў форме суверэннай сав. рэспублікі. Паліт., эканам. і ідэалаг. асновы яго дзейнасці склалі ідэі *Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917*, Дэкларацыі правоў народаў Расіі, Дэкларацыі правоў працоўнага і эксплуатуемага народа. Яго перадумовай стала пастанова кафэрэнцыі бел. секцый РКП(б) (21—23.12.1918, Масква) аб неабходнасці абвяшчэння Беларусі рэспублікай і стварэння Рабоча-сял. ўрада. Выбранаму для гэтага канферэнцыяй Цэнтр. бюро бел. секцый было даручана аб'яднаць намаганні камуністаў у справе будаўніцтва нац. дзяржавы.

Пра рашэнні канферэнцыі стала вядома ЦК РКП(б), СНК і ВЦВК РСФСР, якія вылучылі спец. прадстаўнікоў для абмеркавання гэтых праблем з дзеячамі Беларусі. На фарміраванне бел. ўрада ўплывалі абмежаваны час для пошуку неабходных кандыдатур, недаацэнка нац. пытання Аблвыкамзахам (кіруючы орган *Заходняй вобласці*, у якую ўваходзіла Беларусь), пэўны паліт. недавер з боку Аблвыкамзаха да членаў *Беларускіх секцый РКП(б)* і *Беларускага нацыянальнага камісарыята* (Белнацкома). Пытанні колькаснага і персанальнага складу бел. ўрада, яго функцый, структуры 25.12.1918 абмяркоўваліся ў Маскве наркомам па справах нацыянальнасцей І.В.Сталіным з прадстаўнікамі Цэнтр. бюро бел. секцый, к-та Маск. бел. секцыі РКП(б), супрацоўнікамі Белнацкома, 27.12.1918 — з кіруючымі асобамі Аблвыкамзаха А.Ф.Мясніковым і М.І.Калмановічам. На апошняй сустрэчы разглядаліся таксама т.зв. «Шэсць умоў тав. Сталіна па стварэнні БССР і Кампартыі Беларусі», сутнасць якіх — імкненне аўтара да аўтанамізацыі нярускіх нац. рэспублік. VI Паўн.-Зах. абл. канферэнцыя РКП(б) [гл. *Першы з'езд КП(б)Б*], якая прыняла рашэнне аб утварэнні БССР, даручыла абранаму на ёй *Цэнтральнаму Бюро* КП(б)Б [КП(б)Б] правесці арганізац. работу па зацвярджэнні членаў урада. Яго колькасны склад не раз мяняўся (15, 17 і, нарэшце, 19 чал.). Ад Бел. секцыі РКП(б) і Белнацкома ва ўрад увайшло 7 чал., ад Аблвыкамзаха — 12. Старшыня ўрада — З.Х.Жылуновіч (Ц.Гартны), камісары: замежных спраў У.С.Фальскі, нацыянальнасцей Ф.Г.Шантыр, нар. асветы А.Р.Чарвякоў, ваен. спраў Мяснікоў, фінансаў І.І.Рэйнгольд, харчавання Калмановіч, земляробства А.А.Андрэеў, унутр. спраў С.В.Іваноў, працы І.Л.Дыла, сац. забеспячэння Дз.С.Чарнушэвіч, аховы здароўя І.І.Пузыроў, поштаў і тэлеграфаў К.Ф.Разенталь, шляхоў зносін І.П.Савіцкі, юстыцыі А.І.Квачанюк, дзярж. кантролю С.І.Берсан, старшыні Савета нар. гаспадаркі (СНГ) Р.В.Пікель, Цэнтрапленбежа Р.П.Найдзёнкаў, Надзвычкома В.І.Яркін; кіраўнік спраў урада В.Г.Кнорын, сакратары А.М.Антанікоўскі і Г.Д.Антонаў. На пасяджэнні ўрада абраны яго Прэзідыум з 3 чал.: Жылуновіч (старшыня), Мяснікоў, Калмановіч. Упершыню поўны склад урада надрукаваны 15.1.1919 у газ. «Звезда». Друкаваным органам урада стала газ. «Вестки Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўраду Беларусі», якая выдавалася на бел., рус., польск. і яўр. (ідыш) мовах. 1.1.1919 Жылуновіч, Мяснікоў, Рэйнгольд, Чарвякоў, Іваноў падпісалі *Маніфест Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі*. Гэты дзень стаў днём нараджэння БССР і яе ўрада. Маніфест дэкларавaў паліт., эканам. і сац. асновы новай краіны, ануляваў пастановы, дагаворы, загады і распараджэнні акупац. улад, абвясціў па-за законам *Раду Беларускай Народнай Рэспублікі*, утвораную 18.3.1918. Адным з гал. кірункаў эканам. палітыкі ўрад абвясціў нацыяналізацыю памешчыцкіх, манастырскіх і царк. зямель, пераход да дзяржавы лясоў, чыгункі, поштаў і тэлеграфаў, фабрык, заводаў, банкаў; устанаўліваў 8-гадзінны рабочы дзень. Маніфест абнародаваны ў газ. «Звезда» (3.1.1919), «Жизнь национальностей» (5.1.1919), «Известия Витебского Совета» (10.1.1919). Усе пасяджэнні ўрада адбываліся ў Мінску: 7, 11, 16, 17, 21 і 27.1.1919. З-за розных поглядаў Жылуновіча і Мяснікова [з 1.1.1919 старшыня ЦБ КП(б)Б, з 21.1.1919 старшыня Ваенна-рэв. Савета БССР] на асаблівасці самавызначэння Беларусі, узаемаадносіны ўрада і парт. кіраўніцтва, некат. кадравыя пытанні Масква прызначыла ўпаўнаважаных пры ўрадзе і ЦБ КП(б)Б — Д.Ю.Гопнера ад СНК РСФСР і А.А.Іофе ад ЦК РКП(б). З гэтага моманту Сталін адышоў на 2-і план. Інтарэсы ўрада ў СНК РСФСР прадстаўляў Белнацком. Незалежнасць Беларусі як дзяржавы ВЦВК РСФСР прызнаў толькі 31.1.1919. У ліку першых дзярж. актаў урада былі пастановы аб дзейнасці ў пераходны перыяд дэкрэтаў і пастаноў РСФСР (10.1.1919), пераходзе ўлады ў БССР у рукі Часовага ўрада, скасаванні Аблвыкамзаха і Мінскага губрэўкома (19.1.1919).

Значную ўвагу ўрад аддаваў крыніцам фарміравання бюджэту і яго размеркаванню. Крыніцы заставаліся тыя, што існавалі ў губернскіх бюджэтаў: адлічэнні ад усіх відаў падаткаў, пазыкі. Пры ўрадзе дзейнічала спец. бюджэтна-фін. камісія з прадстаўнікоў камісарыятаў фінансаў, унутр. спраў, дзярж. кантролю для дакладнага і справядлівага размеркавання грошай. Для аднаўленчых работ Беларусі патрэбен быў крэдыт у суме 25 млн. руб., але атрымала яна толькі 10 млн. Ажыццявіць значную працу ў агр. сектары ўрад не змог з-за адхілення членамі ЦБ КП(б)Б 2.1.1919 тэзісаў Андрэева па зямельным пытанні, у якіх прапаноўваўся план эвалюц. пераходу ад прыватнай да калектыўнай форм зямельнай уласнасці. Камісарыят земляробства арганізаваў закупку насення ў цэнтры Расіі да сяўбы, зацвердзіў цэны на лясныя матэрыялы, што адпускаліся насельніцтву, накіраваў цыркуляр губернскім аддзелам рэспублікі і павятовым зямельным аддзелам Мінскай губ. пра парадак выканання законаў урадаў РСФСР і БССР, распараджэнняў Камісарыята земляробства БССР і абскарджання рашэнняў зямельных органаў. Камісарыят харчавання разгледзеў пытанні аб знятці перашкод на ўвоз у Мінск і Мінскую губ. харч. прадуктаў, арганізацыі Мінскага харч. к-та і каап. камісіі пры камісарыяце. Камісарыят асветы ўстанавіў сувязі з Наркаматам асветы РСФСР у пазашкольнай адукацыі, прааналізаваў зместкі пра колькасць школ і вучняў у Бабруйскім, Барысаўскім, Ігуменскім, Рэчыцкім, Мазырскім, Пінскім, Слуцкім, Навагрудскім, Слонімскім, Ашмянскім, Вілейскім, Свянцянскім пав., выдаткаваў сродкі на заснаванне ў Мінску і губ. цэнтрах рэспублікі бел. сав. тэатр. устаноў. Камісарыят па справах нацыянальнасцей 30.1.1919 надрукаваў паведамленне аб рэгістрацыі дзярж. і грамадскіх аб'яднанняў, якія маюць па сваёй сутнасці нац. характар. Камісарыят поштаў, тэлеграфаў і тэлефонаў 16.1.1919 паведаміў пра аднаўленне паштовай і тэлеграфнай сувязі з Баранавічамі і інш. гарадамі зах. часткі Беларусі. СНГ прыняў пастановы аб нацыяналізацыі прам-сці, рэарганізацыі ляснога аддзела СНГ, стварэнні часовай камісіі пры СНГ па абследаванні і арганізацыі вінакурнай прам-сці, перадачы сыраварных і масларобчых устаноў з падпрадкавання Камісарыяту земляробства ў распараджэнне СНГ. Наркамат юстыцыі ажыццяўляў кантроль за нарматворчай дзейнасцю ўрада і яго камісарыятаў, 20.1.1919 ён даслаў у Камісарыят поштаў, тэлеграфаў і тэлефонаў ліст аб неабходнасці накіравання дэкрэтаў і пастаноў прынцыповага характару на папярэдняе рэдагаванне ў аддзел заканадаўчых пастаноў і кадыфікацыі пры Камісарыяце юстыцыі БССР. Урад узначаліў БССР у межах Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай, Гродзенскай і Смаленскай губ. ЦК РКП(б) без папярэдніх кансультацый з прадстаўнікамі Беларусі 16.1.1919 прыняў пастанову пра аддзяленне ад БССР Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губ. У сувязі з гэтым 22.2.1919 Жылуновіч, Квачанюк, Чарнушэвіч, Дыла, Шантыр, Фальскі, Чарвякоў і Пузыроў накіравалі ўпаўнаважаному ЦК РКП(б) Іофе пісьмо-пратэст. Намаганні ўрада былі падтрыманы членамі ЦБ КП(б)Б. Масква ў асобе старшыні ВЦВК Свярдлова пацвердзіла сваё рашэнне і паведаміла пра хуткае аб'яднанне БССР з Літоўскай сав. рэспублікай.

З Часовага рабоча-сял. сав. ўрада Беларусі бяруць пачатак сучасныя рэсп. мін-вы і к-ты: фінансаў, адукацыі, сац. абароны, сельскай гаспадаркі і харчавання, аховы здароўя, працы, юстыцыі, унутр. спраў, па справах нацыянальнасцей, дзярж. кантролю, сувязі і інш. Канфрантацыя ЦБ КП(б)Б з урадам вылілася ў намаганні ЦБ прыняць 20.1.1919 новую структуру бел. ўрада. З 18 камісарыятаў павінны былі застацца 7, астатнія пераўтвараліся ў аддзелы. Спробу ЦБ КП(б)Б рэстаўрыраваць Аблвыкамзах не падтрымалі ЦК РКП(б) і СНК РСФСР. Часовы рабоча-сял. сав. ўрад спыніў існаванне ў перыяд работы *Першага Усебеларускага з'езда Саветаў* (2—3.2.1919, Мінск), які прыняў *Канстытуцыю Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь 1919* і выбраў *Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР*.

Літ.: Каменская Н.В. Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і ўтварэнне БССР. Мн., 1954; Куличенко М.И. Борьба Коммунистической партии за решение национального вопроса в 1918—1920 гг. Харьков, 1963; Круталевич В.А. Рождение Бело-

русской Советской Республики. [Т. 2]. Мн., 1979; Яго ж. История Беларуси: становление нац. державности (1917—1922 гг.). Мн., 1999; Игнатенко И.М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии. Мн., 1992; Ладысеў У.Ф. Брыгадзін П.І. На пераломе эпох: станаўленне бел. дзяржаўнасці (1917—1920 гг.). Мн., 1999; Круталевіч В.А., Юхо І.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917—1945 гг.). 2 выд. Мн., 2000; Сташкевич Н.С. Советская Белоруссия: история возникновения // К единому государству: о создании рос.-бел. Союзного гос-ва. М., 2001. *Я.І.Бараноўскі, В.Дз.Селяменеў.*

ЧАСО́ВЫ РАБО́ЧЫ І СЯЛЯ́НСКІ ЎРАД, назва першага сав. ўрада Расіі пасля Кастр. рэвалюцыі 1917. III Усерас. з'езд Саветаў 18(31).1.1918 зацвердзіў назву Рабочы і сял. ўрад Рас. Сав. Рэспублікі; канстытуцыя РСФСР 1918 (10.7.1918) перайменавала яго ў *Савет Народных Камісараў* РСФСР.

ЧАСО́ВЫ РЭВАЛЮЦЫ́ЙНЫ КАМІТЭ́Т ЗАХО́ДНЯГА ФРО́НТУ (ЧРК ЗФ), грамадска-палітычная арг-цыя ў жніўні—верасні 1917, створаная для аховы парадку і прадухілення магчымых выступленняў у падтрымку *Карнілава мяцяжу 1917*. Створаны з членаў Выканаўчага к-та Зах. фронту (Выкамзаха), прадстаўнікоў *Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў*, Савета сял. дэпутатаў Мінскай і Віленскай губ., Мінскай гар. думы. Пачаў фарміравацца ў ноч на 10.9.1917 на пасяджэнні членаў Выкамзаха (33 чал.) пры ўдзеле франтавога камісара У.В.Жданава пасля абмеркавання атрыманай ад міністра-старшыні Часовага ўрада А.Ф.Керанскага тэлеграмы пра яго канфлікт з «былым вярхоўным галоўнакамандуючым Карнілавым» і просьбай аб падтрымцы законнай улады. У выніку на пасяджэнні прынята каля 15 пастаноў, скіраваных на мабілізацыю сіл і сродкаў для барацьбы з мяцежнікамі на фронце і ў тыле, найперш у Мінску. На 2-м пасяджэнні Выкамзаха створаны агульны рабочы орган — ЧРК ЗФ, які сканцэнтраваў у сваіх руках дзейнасць асн. грамадска-паліт. арг-цый фронту. Агульнае кіраўніцтва к-там ажыццяўляў Жданаў. Адначасова к-т папоўніўся прадстаўнікамі Савета рабочых і салдацкіх (Н.Д.Зальманаў, К.І.Ландар, Р.Л.Хасін) і Савета сял. дэпутатаў (І.П.Несцераў і А.І.Главінскі). Кіраўнікам к-та выбраны старшыня Выкамзаха Кажэўнікаў, яго нам. — Ландар. З 10 членаў ЧРК ЗФ 7 былі эсэры, 1 бальшавік, 1 бундавец. З мэтай прадухіліць выкарыстанне Л.Г.*Карнілавым* салдат Зах. фронту для барацьбы супраць Часовага ўрада к-т перапыніў сувязь карнілаўскіх войск са Стаўкай у Магілёве; на ўсе вузлавыя чыг. станцыі Мінскай ваен. акругі накіраваны ўпаўнаважаныя камісара фронту з правамі кантролю за перасоўваннем войск. К-т выдаў распараджэнне аб арышце асоб, якія вялі пагромную ці контррэв. агітацыю. За час дзейнасці к-та ў Мінску і яго ваколіцах не адбылося ні аднаго выпадку контррэв. ці паліт. акцыі, скіраваных на дэстабілізацыю становішча. Апошняй акцыяй ЧРК ЗФ стала паездка яго прадстаўнікоў разам з ваен. камісарам фронту, ваен. пракурорам і следчай камісіяй у Магілёў 14.9.1917 пасля арышту Карнілава. 14 вер. новы вярх. галоўнакамандуючы Керанскі загадам прадпісаў Жданаву спыніць дзейнасць ЧРК ЗФ. 15 вер. нарада ўсіх прадстаўнікоў ЧРК ЗФ, напэўна, выказалася за спыненне дзейнасці к-та, бо 22 вер. на пасяджэнні Мінскай гар. думы яе старшыня Вайнштэйн абвясціў пра скасаванне ЧРК ЗФ.

Літ.: Сяменчык М.Я. Грамадска-палітычнае жыццё ў Мінску (сакавік—красавік 1917 г.). Мн., 1994. *М.Я.Сяменчык.*

ЧАСО́ВЫ ЎРАД у Расіі, цэнтральны орган дзярж. улады пасля *Лютаўскай рэвалюцыі 1917*. Сфарміраваны *Часовым камітэтам Дзяржаўнай думы 1917* са згоды выканкома Петраградскага савета, з якім да *ліпеньскага крызісу 1917* падзяляў уладу (гл. *Двоеўладдзе*). Вышэйшы выканаўча-распарадчы орган; выконваў таксама і заканад. функцыі. Змяніліся 4 склады Ч.ў.: 1-ы (2 акцябрысты, 8 канстытуцыйных дэмакратаў і тых, хто прымыкалі да іх, 1 трудавік, пазней эсэр; старшыня — Г.Я.*Львоў*) — да 6(19).5.1917 (гл. *Красавіцкі крызіс 1917*); 2-і (1 акцябрыст, 8 канстытуцыйных дэмакратаў і тых, хто прымыкаў да іх, 3 эсэры, 2 меншавікі; старшыня — Львоў) — да 24.7(6.8).1917; 3-і (7 канстытуцыйных дэмакратаў і тых, хто прымыкаў да іх, 5 эсэраў і народных сацыялістаў, 3 меншавікі; старшыня — А.Ф.*Керанскі*) — да 1(14).9.1917, калі ў сувязі з *Карнілава мяцяжом 1917* перадаў уладу Дырэкторыі з 5 міністраў на чале з Керанскім; 4-ы (6 канстытуцыйных дэмакратаў і тых, хто прымыкаў да іх, 2 эсэры, 4 меншавікі, 6 беспарт., старшыня — Керанскі) — з 25.9(8.10).1917. Мясц. органамі ўлады Ч.ў. былі ўстановы яго губ. і пав. камісараў (у Віцебскай губ. А.Валковіч, у Магілёўскай — Судзілоўскі, потым Н.Друцкі-Сакалінскі, у Мінскай — Б.М.Самойленка, на Зах. фронце — В.А.Жданаў). У сваёй праграмнай дэкларацыі ад 3(16).3.1917 і звароце да грамадзян Расіі 6(19).3.1917 Ч.ў. абвясціў прынцып «пераемнасці ўлады» і «бесперапыннасці права», аб імкненні ўдзельнічаць у 1-й сусв. вайне «да пераможнага канца» і выканаць усе дагаворы і пагадненні з саюзнымі дзяржавамі. Скасаваў катаргу і паліт. ссылку, абвясціў паліт. амністыю, замяніў паліцыю нар. міліцыяй. Прыняў закон аб свабодзе сходаў і саюзаў, выдаў указы аб перадачы дзяржаве зямель імператарскай сям'і, аб рабочых к-тах, увёў манаполію хлебнага гандлю. 1(14).9.1917 абвясціў Рас. рэспубліку, 14(27).9.1917 склікаў Дэмакр. нараду, якая стварыла *Прадпарламент*. Абяцаў склікаць *Устаноўчы сход*. Скінуты 25.10(7.11).1917 у ходзе *Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917*.

Літ.: Катков Г.М. Февральская революция: Пер. с англ. М., 1997.

ЧАСО́ВЫ ЎРАД ВЯЛІ́КАГА КНЯ́СТВА ЛІТО́ЎСКАГА, Камісія часовага кіравання Вялікага княства Літоўскага (Komisja Rządu Tymczasowego w Wielkim księstwe Litewskim), каардынацыйна-калегіяльны орган вышэйшай цывільнай улады, створаны ў ходзе *вайны 1812* паводле загаду Напалеона 1.7.1812 у Вільні для адм. кіравання акупіраванымі тэрыторыямі Беластоцкай вобл., Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губ., перайменаваных у дэпартаменты. Складаўся са старшынь 7 камітэтаў: харчавання і магазінаў (С.Солтан), скарбу (К.Прозар, гл. ў арт. *Прозары*), паліцыі (Ю.*Серакоўскі*), ваеннага (А.Сапега, гл. ў арт. *Сапегі*), судовага (Ф.Ельскі, гл. ў арт. *Ельскія*), унутр. спраў (А.Патоцкі), нар. асветы і духоўных спраў (Я.*Снядэцкі*). Генеральным сакратаром прызначаны Ю.Касакоўскі, імператарскім камісарам пры ўрадзе — барон Л.П.Э.Біньён (1.7.1812). Старшыня ўрада Солтан, 24.8.1812 яго змяніў ваенны ген.-губернатар Літвы, граф Д. ван Гогендорп. 14.7.1812 урад далучыўся да *Генеральнай канфедэрацыі 1812* у Варшаўскім княстве, аднак Напалеон не задаволіў просьбу пра аб'яднанне ВКЛ з Варшаўскім княствам. Гал. мэта ўрада — збор усяго неабходнага для патрэб «Вял. арміі». Асн. функцыі: фарміраванне *літоўскіх войск 1812*, нарыхтоўка і дастаўка правіянту і фуражу, кіраванне фінансамі краю, арг-цыя судаводства, адукацыі і інш. З 2.7.1812 да 30.7.1813 правёў 134 пасяджэнні. З-за шэрагу аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў Часовы ўрад не змог разгарнуць дзейнасць у поўным аб'ёме. Пасля разгрому напалеонаўскай арміі ўрад дзейнічаў у эміграцыі; спыніў дзейнасць у Дрэздэне.

Літ.: Ліс Я. Палітыка Напалеона на Беларусі // Спадчына. 1996. № 5; Швед В. Вялікае княства Літоўскае ў 1812 г. // Бел. гіст. часоп. 2000. № 3. *А.У.Ерашэвіч.*

ЧАСО́ВЫЯ ЎПРАЎЛЕ́ННІ ў Заходняй Беларусі, паўнамоцныя органы ўлады, створаныя ў вер. 1939 на вызваленых Чырв. Арміяй землях Зах. Беларусі, таксама ў зах. пав. Беластоцкага ваяв., Астралэнцкім і Востраў-Мазавецкім пав. Варшаўскага ваяв. Выконвалі функцыі часовай адміністрацыі на працягу вер. 1939 — 1-й пал. 1940. Ствараліся паводле пастановы ваен. савета Бел. фронту ад 16.9.1939 і загаду камандуючага фронтам М.П.Кавалёва ад 19.9.1939. Як правіла, у іх уваходзілі па аднаму прадстаўніку ад Чырв. Арміі (палітработнік), Наркамата ўнутр. спраў, а таксама прадстаўнікі рабочых, інтэлігенцыі, сял. к-таў, партыз. атрадаў; зрэдку ўключаліся і б. члены КПЗБ. З 2.10.1939 важнай паліт. задачай Ч.у. стала арганізацыя мерапрыемстваў у сувязі з выбарамі ў *Народны сход Заходняй Беларусі*. Многія з прадстаўнікоў Ч.у. былі выбраны яго дэпутатамі і

галасавалі за ўстанаўленне сав. улады і ўваходжанне Зах. Беларусі ў склад БССР. Ч.ў. сваімі практычнымі дзеяннямі (нацыяналізацыя прам-сці, банкаў і гандл. прадпрыемстваў, стварэнне калгасна-саўгаснай сістэмы) стварылі падмурак для пераводу эканомікі краю на сацыяліст. лад. *У.Ф.Ладысеў.*

ЧАСО́ПІС, перыядычнае выданне, якое публікуе навук., гіст., маст. або літ.-публіцыст. матэрыялы; як і *газета*, адзін з асн. сродкаў масавай інфармацыі. Ч., як правіла, арыентуецца на пэўную аўдыторыю: паводле прафес. прызначэння, узросту, прыхільнасцей, сац., сац.-паліт., дэмаграфічных і інш. прыкмет. Тыпалагічна Ч. падзяляюць на грамадска-паліт., літ.-маст., сатыр., навук.-галіновыя, навук.-папулярныя, навук.-інфарм., вытв.-тэхн., а таксама для жанчын, моладзі, дзяцей і інш. Выходзяць штотыднёва, раз у 2 тыдні, штомесяц, штоквартальна.

Першым Ч. лічыцца «Le journal des savants» («Часопіс вучоных»), які выйшаў у Францыі ў 1665; першы Ч. у Расіі — «Ежемесячные сочинения, к пользе и увеселению служащие» (1755). Выдавецкая дзейнасць бел. студэнтаў у Пецярбургу прывяла да выпуску ў 1884 двух нумароў Ч. «*Гомон*». У пач. 20 ст. на Беларусі выдаваліся Ч. «*Крапіва*», «*Саха*», «*Лучынка*», «*Раніца*»; галіновыя выданні: «*Белорусский учительский вестник*», «Медицинское дело» (1910), «Минские врачебные известия» (1910—15), «*Педагогическое дело*», «Спорт» (1913); Ч. для дзяцей «Зорька» (1905—12). Бел. выдавецкае т-ва «Загляне сонца і ў наша аконца» выдавала Ч. «*Маладая Беларусь*». Першыя бел. сав. Ч. — «Чырвоны шлях» (1918), «Белорусская криница» (1918—19), «Народная асвета», «Факел коммунизма» (абодва 1919), «Коммунистический труд» (1919—23), «Школа и культура Советской Белоруссии», «*Вольны сцяг*», «*Вестник народного комиссариата просвещения*», «*Полымя*», «Бюллетень Центрального бюро Коммунистической партии (большевиков) Белоруссии» (1923), «*Камуністычнае выхаванне*»; галіновыя Ч. — «Хозяйство Белоруссии» (1920—21), «Шлях кааперацыі» (1925—28), «Прафесіянальны рух Беларусі» (1925—29), «Шляхі калектывізацыі» (1925—33); пазней — «*Маладняк*», «*Наш край*», «*Узвышша*», «Саветы Беларусі» (1928—31) і інш. У Зах. Беларусі выдаваліся Ч. «*Бальшавік*», «*Маланка*», «*Беларуская культура*», «*Беларускі летапіс*», «*Асва*», «Маладая Беларусь» і інш. (гл. ў арт. *Заходнебеларускі друк*). У Вял. Айч. вайну на тэр. Беларусі выходзіла каля 100 перыяд. выданняў на бел., рус., ням., укр. мовах (гл. *Друк акупацыйны* ў Вял. Айч. вайну, *Друк падпольны* ў Вял. Айч. вайну). У пасляваен. гады на Беларусі выдавалася каля 130 Ч. і інш. перыяд. выданняў тыпу Ч., у т.л. «*Коммунист Белоруссии*», «*Полымя*», «Работніца і сялянка» (з 1995 «*Алеся*»), «*Народная асвета*», «Здравоохранение Белоруссии» (з 1996 «*Здравоохранение*»), «*Бярозка*», «*Беларусь*», «*Весці Акадэміі навук Беларусі*», «*Вожык*», «*Нёман*», «*Маладосць*», «Сельское хозяйство Белоруссии» (з 1991 «*Хозяин*»), «*Доклады Академии наук Беларуси*», «*Вясёлка*», «На экранах Беларусі» (з 1996 «*На экранах*»), «*Инженерно-физический журнал*», «Тэатральны Мінск» (1961—90), «*Журнал прикладной спектроскопии*», «*Дифференциальные уравнения*», «*Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта*», «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі» (з 1989 «*Спадчына*»), «*Родная прырода*», «Мастацтва Беларусі» (з 1992 «*Мастацтва*»), «Беларуская мова і літаратура ў школе» (з 1992 «*Роднае слова*»). У 1990-я г. Ч. пачалі выдаваць грамадскія, культ. і інш. аб'яднанні, творчыя, прафес. саюзы і калектывы: «*Веснік Беларускага экзархата*», «*Беларуская думка*», «Пачатковая школа» (з 1991), «*Пралеска*», «Гаспадыня» (з 1992), «*Беларускі гістарычны часопіс*», «*Веснік Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта*», «Армия», «Всемирная литература», «Вышэйшая школа», «Пазашкольнае выхаванне» (усе з 1996), «Атэстацыя», «Белорусский экономический журнал» (абодва з 1997) і інш. На 1.2.2003 на Беларусі зарэгістравана 442 Ч.

Літ.: Перыядычны друк Беларусі, 1817—1916 гг.: Бібліягр. паказ. Мн., 1960; Перыядычны друк Беларускай ССР (1917—1958). Вып. 1. Часопісы. Мн., 1960; Друк Беларускай ССР, 1966—1970: Статыстыч. матэрыялы. Мн., 1972; Говін С.В. Друк Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.). Мн., 1974; Адамовіч В.С. Падпольныя перыядычныя выданні на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны: Бібліягр. паказ. Мн., 1975; Булацкі Р.В., Сачанка І.І., Говін С.В. Гісторыя беларускай журналістыкі. Мн., 1979; Пресса Республики Беларусь. Мн., 1998.

В.С.Лукін.

«ЧАСО́ПІС» («Czasopis»), інфармацыйна-культурны часопіс Усх. Беласточчыны; орган Аб'яднання бел. журналістаў у Польшчы. Выдаецца з крас. 1990 штомесячна ў Беластоку на польскай мове, частка матэрыялаў — на беларускай. Гал. рэдактар Ю.Хмялеўскі. Аналізуе паліт. падзеі ў Польшчы, Беларусі, Расіі, Літве і зах.-еўрап. краінах; асвятляе царк. жыццё ў Польшчы і на Беласточчыне, гісторыю правасл. прыходаў у краі, праблемы грамадска-паліт. і культ. жыцця беларусаў у Польшчы, нац. жыццё, сац.-эканам. і паліт. становішча бел. нац. супольнасці ў Польскай дзяржаве, праблемы эканам. сучаснай Беласточчыны; змяшчае агляды польскага і беларускамоўнага перыяд. друку ў Польшчы і Беларусі, артыкулы па рэліг. тэматыцы і гісторыі хрысціянства, календары рэліг. свят. Друкуе ўспаміны ўдзельнікаў гіст. падзей у Польшчы і на Беларусі, артыкулы пра дзеячаў бел. культуры, нататкі пра гміны, вёскі, правасл. прыходы, цэрквы на Беласточчыне, літ. і публіцыст. творы бел. пісьменнікаў Беласточчыны, дыскусійныя матэрыялы, лісты чытачоў, інтэрв'ю з прадстаўнікамі дзярж. улад і вышэйшага рэліг. правасл. кіраўніцтва. Выданне ілюстраванае. *Л.У.Языковіч.*

ЧАСТАТА́ ў тэорыі імавернасцей, адносіны *m/n* ліку *m* паяўленняў некаторай падзеі ў дадзенай паслядоўнасці выпрабаванняў да агульнага ліку выпрабаванняў *n*. Калі выпрабаванні незалежныя і існуе пэўная *імавернасць p* паяўлення дадзенай падзеі ў асобным выпрабаванні, то паводле *вялікіх лікаў закону* Ч. гэтай падзеі набліжаецца да *p* пры неабмежаваным павелічэнні ліку выпрабаванняў. У матэм. статыстыцы Ч. наз. лік элементаў, выбраных з дадзенай сукупнасці па пэўнай прыкмеце.

ЧАСТАТА́ ВАГА́ННЯЎ, фізічная велічыня, роўная адносінам колькасці поўных цыклаў ваганняў да прамежку часу, за які яны адбываюцца. Ч.в. $\nu = 1/T$, дзе T — *перыяд ваганняў*. Вуглавая Ч.в. $\omega = 2\pi\nu = 2\pi/T$. Адзінка Ч.в. у СІ — *герц*, вуглавой Ч.в. — радыян за секунду (рад/с).

ЧАСТАТАМЕ́Р, прылада для вымярэння частаты перыядычных працэсаў. Найб. пашыраны Ч. для вымярэння *частаты ваганняў* электра- і радыёсігналаў (хвалямеры; частату вярчэння валоў механізмаў і машын вымяраюць

Сучасныя беларускія **часопісы**.

тахометрамі). Адрозніваюць Ч. з электравымяральнымі механізмамі, электронныя аналагавыя і лічбавыя Ч. На практыцы ў якасці Ч. выкарыстоўваюць таксама *асцылографы*.

ЧА́СТКА І ЦЭ́ЛАЕ, філасофскія катэгорыі, якія характарызуюць адносіны паміж сукупнасцю прадметаў ці элементаў асобнага аб'екта і *сувяззю*, што іх аб'ядноўвае. Праблема Ч. і ц. пастаўлена яшчэ ў ант. філасофіі (атамістыка, Платон, Арыстоцель); яна разглядалася ва ўсіх значных філас. вучэннях (матэрыялізм, схаластыка, ням. класічная філасофія і інш.). У філасофіі 20 ст. склаліся 2 процілеглыя тэндэнцыі: мерызм (яе прадстаўнікі абсалютызавалі ролю часткі) і *халізм* (абсалютызацыя цэлага). Дыялект. падыход зыходзіць з таго, што суадносіны паміж Ч. і ц. могуць характарызавацца *адытыўнасцю* (калі цэлае роўна суме частак), суперадытыўнасцю (калі цэлае не зводзіцца да сумы частак і характарызуецца новымі інтэгратыўнымі якасцямі), субадытыўнасцю (частка дастатко[illegible] незалежная ад цэлага). Паняцце [illegible]кі абазначае фрагмент, момант цэлага, таму ў працэсе пазнання Ч. і ц. не павінны разглядацца асобна. Напр., элементарныя часціцы, якія валодаюць дваістай карпускулярна-хвалевай прыродай, непасрэдна звязаны з палямі: энергія і імпульс якіх непасрэдна складаюцца з мноства асобных порцый — квантаў (гл. *Квантавая тэорыя поля*). У палях бесперапыннасць спалучаецца з перапыннасцю, г.зн. з пэўнай частковасцю. Уласцівыя мозгу чалавека ідэальныя прадукты дзейнасці, розныя псіхічныя з'явы, у т.л. мысленне, таксама раздзелены на пэўныя функцыянальныя часткі. Паняцці Ч. і ц. ўжываюцца і ў адносінах працэсаў руху, функцыянавання і развіцця, у якіх вылучаюцца пэўныя моманты, стадыі, ступені і т.п. У працэсах развіцця суадносіны частак паміж сабой і з цэлым змяняюцца, узнікаюць новыя часткі і новыя сувязі, што выяўляецца ў працэсе дыферэнцыяцыі і інтэграцыі. Сучасная навука прытрымліваецца *сістэмнага падыходу* ў аналізе Ч. і ц., пры якім адрозніваюцца сістэмы інтэгральныя і суматыўныя ў залежнасці ад перавагі адпаведных уласцівасцей. Пастулат аб прымаце над часткай нярэдка выкарыстоўваўся для апраўдання таталітарных ідэалогій і паліт. рэжымаў (фашызм і інш.), якія ігнаруюць правы і свабоды асобы. Абсалютызацыя ролі часткі знайшла сваё ўвасабленне ў канцэпцыі «сацыяльнага атамізму», у адпаведнасці з якой перавага аддаецца інтарэсам індывіда, а інтарэсы грамадства — падпарадкаваны апошнім. Гл. таксама *Цэласнасць*.

В.Дз.Марозаў, С.А.Яцкевіч.

ЧА́СТКІ СВЕ́ТУ, умоўны падзел буйных тэрыторый сушы з размешчанымі каля іх астравамі. Вылучаюць 6 асноўных Ч.с.: *Антарктыда, Аўстралія, Афрыка* (супадаюць з мацерыкамі), *Еўропа* і *Азія* (уваходзяць у склад мацерыка Еўразія, *Амерыка* (уключае 2 мацерыкі — Паўн. і Паўд. Амерыку). Часам, акрамя пералічаных, вылучаюць 7-ю Ч.с. — *Акіянію*, як сукупнасць мноства ціхаакіянскіх астравоў.

ЧАСТКО́ВАЯ ВЫТВО́РНАЯ, паняцце *дыферэнцыяльнага злічэння*, якое характарызуе скорасць змены функцыі некалькіх пераменных пры зменах толькі аднаго аргумента.

Для функцыі $u = f(x_1,x_2,...,x_n)$ Ч.в. 1-га парадку (першая Ч.в.) па адным з аргументаў вызначаецца як звычайная *вытворная* пры ўмове, што астатнія аргументы захоўваюць пастаянныя значэнні. Вызначаныя такім чынам першыя Ч.в. як функцыі тых жа аргументаў могуць у сваю чаргу мець Ч.в., якія ў дачыненні да зыходнай функцыі наз. Ч.в. 2-га і г.д. парадку.

ЧАСТО́ТНАЕ ТЭЛЕГРАФАВА́ННЕ, спосаб перадачы тэлеграфных сігналаў па *лініях сувязі* з выкарыстаннем пераменнага току. Пры Ч.т. сігналы пастаяннага току, сфарміраваныя ў *тэлеграфным апараце*, пераўтвараюцца ў сігналы пераменнага току пэўнай частаты і паступаюць у каналаўтваральную апаратуру *многаканальнай сувязі*. Сігналы ў кожным канале сістэмы Ч.т. перадаюцца на «сваёй» *нясучай частаце* з выкарыстаннем частотнай (найб. пашырана), фазавай ці амплітуднай мадуляцыі (гл. *Мадуляцыя ваганняў*).

ЧАСТО́ТНАЯ МАДУЛЯ́ЦЫЯ, від *мадуляцыі ваганняў*, калі сігнал, які перадаецца, кіруе частатой нясучага высокачастотнага вагання. Асаблівасць — высокая перашкодаўстойлівасць. Выкарыстоўваецца для высакаякаснай перадачы інфармацыі ў радыёвяшчанні (у дыяпазоне УКХ), для гукавога суправаджэння тэлевізійных праграм, радыётэлефаніі і інш.

ЧАСТО́ТНЫ СЛО́ЎНІК, тып лінгвістычнага даведніка, у якім адлюстраваны лічбавыя паказчыкі выкарыстання моўных адзінак (афіксаў, словаформ, лексем, словазлучэнняў) у тэкставай выбарцы пэўнага аб'ёму. Да лічбавых паказчыкаў адносяць: частату ўжывальнасці пэўнай адзінкі; колькасць тэкстаў, у якіх выкарыстоўваецца пэўная моўная адзінка; частату ўжывальнасці многазначнай лексемы асобна для кожнага з яе значэнняў; частату выкарыстання слоў пэўнай часціны мовы; частату кожнай з першай тысячы самых ужывальных моўных адзінак і інш. Ч.с. выкарыстоўваюць пры вызначэнні лексічных мінімумаў і напісанні вучэбных дапаможнікаў па мовах, распрацоўцы кодаў для машыннага перакладу, устанаўленні крытэрыяў моўнай нормы, вырашэнні тэарэт. пытанняў фанетыкі, лексікалогіі, граматыкі, стылістыкі пэўнай мовы, іх генет. або тыпалагічнай блізкасці. Першы Ч.с. на Беларусі — спіс найбольш частых слоў, ужытых у артыкуле «Рэалісты» Дз.І.Пісарава, складзены М.Г.Булахавым (1969). Найб. поўны паводле аб'ёму рэестравага матэрыялу і велічыні абследаванай тэкставай выбаркі «Частотны слоўнік беларускай мовы» Н.С.Мажэйкі і А.Я.Супруна (вып. 1—5, 1976—92), кожны выпуск якога пабудаваны на матэрыяле маст. прозы, публіцыстыкі, вуснай нар. творчасці, паэзіі, гутарковай мовы. Зводны «Частотны слоўнік беларускай мовы» Мажэйкі (2003; 1801 тыс. словаўжыванняў) апрача матэрыялаў папярэдняга Ч.с. ўключае вынікі стат. аналізу дзелавых, навук., вучэбных і энцыклапедычных тэкстаў. Ч.с. ствараюць і на ЭВМ (падрыхтаваны «Частотны слоўнік словаформаў» П.Ф.Глебкі ў 2 т.). Да бел. Ч.с. у пэўнай ступені можна аднесці шэраг гіст. канкардансаў [поўны паказальнік слоў з ілюстрацыямі пэўнага літ. тэксту; напр., «Частотны слоўнік» (т. 10, 1992) у рукапісным «Канкардансе беларускай мовы XIX ст.» ў 11 т.] і слоўнікаў мовы пісьменнікаў, паколькі ў іх прадстаўлены і стат. параметры: «Анамастычны слоўнік твораў Якуба Коласа» (1990), «Фразеалагічны слоўнік мовы твораў Я.Коласа» (1993), «Слоўнік мовы Янкі Купалы» ў 8 т. (т. 1—5, 1997—2003) і інш.

Літ.: Алексеев П.М. Статистическая лексикография: (типология, составление и применение частотных словарей). Л., 1975.

В.К.Шчэрбін.

ЧАСТУ́ШКА, тое, што *прыпеўка*.

ЧА́СЦІ АСО́БАГА НАЗНАЧЭ́ННЯ (ЧАН), ваенныя атрады, якія ствараліся пры парт. арг-цыях для дапамогі сав. органам у барацьбе супраць контррэвалюцыі. Арганізацыя ЧАН адносіцца да пач. 1918, калі мясц. ўлады па сваёй ініцыятыве стваралі атрады з прыхільнікаў рэвалюцыі. Адна з форм мабілізацыі рэв. сіл для абароны сацыяліст. дзяржавы, уяўлялі сабой фарміраванні міліцэйскага тыпу. Вясной і летам 1918 ствараліся на неакупіраванай тэр. Беларусі (на У ад р. Дняпро) і дзейнічалі ў Аршанскім, Сенненскім, Гарадоцкім, Горацкім, Клімавіцкім, Чавускім і інш. паветах. Пасля вызвалення Беларусі ад ням. войск (снеж. 1918 — пач. 1919) ЧАН сфарміравалі і ў інш. раёнах рэспублікі. Паводле «Інструкцыі па фарміраванні атрадаў асобага назначэння», выдадзенай ЦК РКП(б) 14.5.1919, атрады складаліся з аддзяленняў, узводаў, рот і батальёнаў. Акрамя ўдзелу ў баявых аперацыях супраць інтэрвентаў і ўнутр. контррэвалюцыі, ЧАН вялі барацьбу супраць бандытаў, дэзерціраў і інш. У ЧАН Зах. фронту на канец 1922 было 22,6 тыс. чал., у т.л. 1800 жанчын; камандуючыя А.І.Ягораў, са студз. 1922 М.М.Тухачэўскі. Найб. шматлікія ЧАН былі ў Мінску, Віцебску, Гомелі (1300—2000 байцоў), падраздзяленні ў Оршы, Магілёве (300—500), Слуцку, Бабруйску, Барысаве, Ігумене, Навагрудку, Полацку, Рагачове (150—200 байцоў). Камандуючыя ЧАН БССР: П.А.Агурэеў, Я.А.Адамовіч, М.Л.Шастакоў; Віцебскай губ. Э.Ф.Біге, Гомельс-

кай губ. П.Ю.Пурвін, А.П.Ведзяняпін. У 1924 у сувязі з амаль паўсюднай ліквідацыяй паліт. бандытызму, узмацненнем Чырв. Арміі, стабілізацыяй міжнар. становішча дзейнасць ЧАН стала паступова згортвацца. Загадам Рэўваенсавета СССР ад 30.3.1924 пачалося іх расфарміраванне. ЧАН БССР расфарміраваны на працягу 25.6—1.7.1924.

Літ.: Мерінг Ф. Милиция и постоянное войско: Пер. с нем. М., 1923; Проко-пенко В.Н., Романов В.М. Советская милиция (1917—1920 гг.). М., 1965; Хохлов А.Г. Коммунистические части особого назначения в Белоруссии. Мн., 1974; Мурашко П.Е. Особого назначения...: Из истории ЧОН Белоруссии, 1918—1924. Мн., 1979.

А.С.Жмуроўскі.

ЧА́СЦІКАВЫЯ РЫ́БЫ, часцік, назва многіх рыб паводле прамысл. класіфікацыі.

Назва ад выкарыстання для лоўлі многіх відаў рыб т.зв. частых (драбнавочкавых) сетак. Ч.р. падзяляюць на буйначасцікавых (лешч, сазан, сом, судак, шчупак і інш.) і драбначасцікавых (акунь, верхаводка, гусцяра, карась, лінь, плотка, чахонь, язь і інш.).

ЧАСЦІ́НЫ МО́ВЫ, лексіка-граматычныя класы слоў, якія характарызуюцца адзінствам абагульненага значэння, агульнасцю грамат. катэгорый і асаблівасцей словазмянення, характарам спалучальнасці з інш. словамі, асн. сінтакс. функцыямі і спосабамі словаўтварэння. Аднясенне слова да пэўнай Ч.м. грунтуецца на аснове ўсіх пералічаных адзнак, але не ўсе яны маюць аднолькавую значнасць. Кожная Ч.м. мае свае спецыфічныя асаблівасці, якія адрозніваюць яе ад інш. Ч.м., і аб'ядноўвае вял. групу слоў з розным лексічным значэннем.

Арыстоцель у 4 ст. да н.э. падзяляў усе словы грэч. мовы на 4 Ч.м.: імя, дзеяслоў, член і злучнік (звязка). Пазней у грэч. і лац. граматыках было вылучана 8 Ч.м.: (імя, дзеяслоў, дзеепрыметнік, член, займеннік, прыназоўнік, прыслоўе, злучнік). Гэта класіфікацыя з нязначнымі зменамі перайшла ў зах.-еўрап. граматыкі, а таксама ў рус. і бел. грамат. працы (М.Сматрыцкі, М.В.Ламаносаў). Рус. вучоныя (А.А.Патабня, П.Ф.Фартунатаў, А.А.Шахматаў, Л.У.Шчэрба, В.У.Вінаградаў) развілі вучэнне аб Ч.м., удакладнілі іх класіфікацыю. У сучасных бел. граматыках традыцыйна вылучаюць 10 Ч.м.: *назоўнік, прыметнік, лічэбнік, займеннік, дзеяслоў, прыслоўе, прыназоўнік, злучнік, часціцы, выклічнік.* Ч.м. падзяляюцца на паўназначныя (назоўнік, прыметнік, лічэбнік, займеннік, дзеяслоў, прыслоўе) і непаўназначныя (службовыя — прыназоўнік, злучнік, часціцы); выклічнік знаходзіцца па-за межамі гэтага падзелу. Сярод паўназначных Ч.м. вылучаюцца ўказальныя словы (займеннікі), якія не называюць прадметаў, прыкмет ці колькасці, а толькі ўказваюць на іх. Астатнія паўназначныя Ч.м. адносяцца да знамянальных. Прыведзеная класіфікацыя Ч.м. пабудавана не на адзінай лагічнай аснове і не ахоплівае ўсе класы слоў. У сучасным мовазнаўстве вядуцца пошукі новай класіфікацыі, абмяркоўваецца правамернасць вылучэння ў асобныя марфал. класы мадальных слоў («відаць», «пэўна»), слоў катэгорыі стану («холадна», «трэба»), звязак («ёсць», «быць»), гукаперайманняў («ку-ку», «таў-гаў»). Паміж Ч.м. заўсёды адбываецца ўзаемадзеянне, адна Ч.м. можа пераходзіць у другую, што абумоўлена зменай сінтакс. функцыі: прыметнікі — у назоўнікі («рабочыя працуюць на заводзе»), прыслоўі — у прыназоўнікі («ходзіць вакол возера») і г.д.

Літ.: Шуба П.П. Уводзіны ў граматыку беларускай мовы. Мн., 1969; Виноградов В.В. Русский язык. 2 изд. М., 1972; Беларуская граматыка. Ч. 1. Мн., 1985.

П.П.Шуба.

ЧАСЦІ́ЦЫ, непаўназначныя словы, якія выражаюць сэнсавыя, мадальныя і эмацыянальныя адценні слоў, злучэнняў і сказаў. Не маюць намінатыўнай функцыі і адпаведных грамат. катэгорый; не ўжываюцца самастойна, не з'яўляюцца членамі сказа. Толькі ў дыялогу некат. Ч. («ага», «але», «вось», «так» і інш.) набываюць значэнне слоўсказаў: «Зразумеў, сынок?— **Так!**» — ціха адказаў Андрэй» (Э.Самуйлёнак).

Паводле марфал. будовы, ужывання, ролі і функцый у мове Ч. падзяляюцца на простыя («амаль», «толькі», «хіба»), састаўныя («ну і», «што за», «дзе там»), невытворныя («а», «але», «і»), вытворныя («проста», «выключна», «такі»), слова- («абы», «не», «ні») і формаўтваральныя («б», «бы», «бадай»). Адрозніваюцца Ч. прэпазіцыйныя («ну», «ці», «ні»), постпазіцыйныя («жа», «ж», «б») і са свабодным месцапалажэннем («вунь», «нават», «ужо»). У ролі Ч. ужываюцца прыслоўі, займеннікі, дзеясловы, злучнікі. Ч. — марфалагічна нязменныя ўтварэнні. У адпаведнасці з функцыянальным прызначэннем падзяляюцца на некалькі разрадаў: Ч., якія выражаюць дадатковыя сэнсавыя адценні (указальныя, азначальна-ўдакладняльныя, вылучальна-абмежавальныя), мадальныя і мадальна-валявыя (сцвярджальныя, адмоўныя, пытальныя, параўнальныя), эмацыянальна-экспрэсіўныя (клічныя, узмацняльныя), структураўтваральныя, з дапамогай якіх утвараюцца новыя словы або формы адпаведных слоў. Ч. далучаюцца да пэўных кампанентаў сказа (слоў, словазлучэнняў) ці ўсяго выказвання.

Літ.: Киселев И.А. Частицы в современных восточнославянских языках. Мн., 1976; Беларуская граматыка. Ч. 1. Мн., 1985.

А.І.Наркевіч.

ЧАСЦЬ ВАЙСКО́ВАЯ, умоўнае лічбавае найменне *воінскай часці*, злучэння і ўстаноў Узбр. Сіл, войск МУС, пагран. войск Рэспублікі Беларусь. Выкарыстоўваецца ва ўзаемаадносінах часцей, злучэнняў паміж сабою, з цывільнымі ведамствамі, арг-цыямі, прадпрыемствамі і інш., а таксама пры перасылцы карэспандэнцыі і грузаў. Для падраздзяленняў, якія ўваходзяць у склад часцей (злучэнняў), да ўмоўнага наймення дадаюць літару (напр., «В/ч 23466-А»).

ЧАТАНУ́ГА (Chattanooga), горад на ПдУ ЗША, штат Тэнесі. 156 тыс. ж. (2000), з прыгарадамі 433 тыс. Буйны трансп. вузел. Порт на р. Тэнесі. Прам-сць: хім. (вытв-сць штучных і сінт. валокнаў, электрахімія), тэкст., харч., цэлюлозна-папяровая, шкляная; чорная металургія (чыгуналіцейныя прадпрыемствы, выплаўка ферасплаваў), металаапрацоўка, машынабудаванне, у т.л. вытв-сць электрабытавых прылад. Ун-т. У прыгарадах буйныя АЭС і ГЭС.

ЧАТКА́ЛЬСКІ ЗАПАВЕ́ДНІК горна-лясны. У зах. адгор'ях *Чаткальскага хрыбта* (Туркменістан). Засн. ў 1947 для аховы прыродных комплексаў горных лясоў і лугоў Зах. Цянь-Шаня. Пл. 35,8 тыс. га. Рэльеф горны (выш. да 4000 м). Клімат рэзка кантынент., з вял. амплітудамі ваганняў тэмператур. У расліннасці 3 паясы: разнатраўнага сухога стэпу туранскага тыпу, дрэвава-кустовага і высакагорнага стэпу. Больш за 600 відаў травяністых і 40 відаў дрэвавых і кустовых раслін. У фауне — цэнтральнаазіяцкі горны казёл, казуля, дзік, сурок Мензбіра (эндэмік), рэліктавы суслік, дзікабраз, белакіпцюрны мядзведзь, воўк, барсук, каменная куніца і інш., трапляецца снежны барс. Сярод птушак пашыраны цемнабрухі улар, кеклік, белагаловы сіп, чорны грыф, барадач; трапляецца чорны каршун, пустальга, арол-карлік. У 1965 на берагах р. Тэрэксай выяўлены стараж. наскальныя малюнкі (петрогліфы).

ЧАТКА́ЛЬСКІ ХРЫБЕ́Т. У зах. Цянь-Шані, у Кыргызстане і Узбекістане, абмяжоўвае з ПнЗ *Ферганскую даліну.* Даўж. каля 200 км. Выш. да 4503 м. Складзены са сланцаў, вапнякоў, гранітаў. Паўн. схіл стромкі, паўд. — больш спадзісты. Хваёва-шыракалістыя лясы, зараснікі арчы, лугі. У адгор'ях — *Чаткальскі запаведнік.*

ЧАТЫРДА́Г, Шацёр-гара, горны масіў у цэнтр. ч. Галоўнай грады Крымскіх гор (Украіна). Даўж. каля 8 км, выш. да 1527 м (г. Эклізі-Бурун). З Пн абмежаваны шырокім перавалам Ангар-Багаз (762 м). Складзены з вапнякоў; карставыя формы рэльефу. На схілах каля 100 пячор, у т.л. Тысячагаловая, Халодная, і каля 1000 карставых варонак, шахтаў, калодзежаў. Лясы з буку, грабу і хвоі.

ЧАТЫРНА́ЦЦАТЫ З'ЕЗД КП(б)Б. Адбыўся 23—29.1.1932 у Мінску. Прысутнічалі 494 дэлегаты з рашаючым і 185 з дарадчым голасам ад 75 238 чл. і канд. у чл. партыі [разам з вайсковымі арг-цыямі; 54 392 чл. і канд. у чл. КП(б)Б]. Парадак дня: справаздачы ЦК КП(б)Б (В.Ф.Шаранговіч), Рэвіз. камісіі КП(б)Б (М.М.Клімковіч), ЦКК КП(б)Б (А.Я.Калнін); аб выніках работы прам-сці за 1931 і перспектывах на 1932 (Р.П.Грысевіч); выбары кіруючых органаў. З'езд адзначыў паспяховае выкананне ў БССР заданняў 1-га пяцігадовага плана. Удзельная вага прам-сці ў нар. гаспадарцы вырасла з 38,7% у 1929/30 да 50% у 1931; створаны новыя галіны прам-сці: с.-г. машынабудавання, штучнага шоўку, буд. матэрыялаў і інш. Аднак нездавальняючымі заставаліся якасныя паказчыкі развіцця эканомікі. За час ад XIII з'езда КП(б)Б (1930) колькасць калгасаў павялічылася на 50%, іх пасяўныя плошчы — у 3 разы. Першачарговымі задачамі з'езд вызначыў барацьбу за якасць вытв-сці, са стратамі і

расхлябанасцю, укараненне гасп. разліку ў цэхі і брыгады, ліквідацыю абязлічкі, арганізац.-гасп. ўмацаванне калгасаў. У ліку дасягненняў адзначаны ліквідацыя ў рэспубліцы непісьменнасці, пераход Беларусі адной з першых у СССР да ўсеаг. навучання, расшырэнне сеткі вышэйшых і сярэдніх спец. навуч. устаноў, рабфакаў, разгортванне н.-д. дзейнасці. Поспехі ў нац. палітыцы і культ. будаўніцтве тлумачыліся разгромам пад кіраўніцтвам КП(б)Б «беларускага контррэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму» і яго «агентуры» ў партыі — нацыянал-апартунізму. Ставілася задача яшчэ большага ўзмацнення барацьбы супраць скажэнняў ленінізму ў тэорыі і практыцы. З'езд ухваліў дырэктывы ЦК ВКП(б) па 2-м пяцігадовым плане развіцця нар. гаспадаркі СССР на 1933—37, даручыў ЦК КП(б)Б забяспечыць на іх аснове распрацоўку 2-га пяцігадовага плана развіцця нар. гаспадаркі і культуры БССР. З'езд выбраў ЦК КП(б)Б з 117 чл. і 56 канд., Рэвіз. камісію КП(Б)Б з 11 чл., ЦКК КП(б)Б з 120 чл.

Літ.: XIV з'езд Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі: Стэнагр. справаздача. Мн., 1934; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 2. 1928—1932. Мн., 1984.

Р.П.Платонаў.

«ЧАТЫРНА́ЦЦАЦЬ ПУ́НКТАЎ», умовы міру (14 артыкулаў), выкладзеныя прэзідэнтам ЗША Т.В.*Вільсанам* у канцы 1-й сусв. вайны ў пасланні да канграса ад 8.1.1918. Прадугледжвалі: адкрытыя мірныя перагаворы; поўную свабоду суднаходства; скасаванне мытных бар'ераў; устанаўленне гарантый, што забяспечвалі б скарачэнне ўзбраенняў; урэгуляванне калан. пытанняў; вызваленне Германіяй усіх акупіраваных тэр. Расіі, у т.л. Беларусі, і магчымасць Расіі самой вызначыць сваё паліт. развіццё; вызваленне і развіццё Бельгіі; вяртанне Эльзаса і Латарынгіі Францыі; аднаўленне акупіраваных Германіяй раёнаў Францыі; выпраўленне межаў Італіі ў адпаведнасці з нац. прыкметай; магчымасці аўт. развіцця народаў Аўстра-Венгрыі; вызваленне Германіяй акупіраваных тэр. Румыніі, Сербіі, Чарнагорыі, уступка Сербіі выхаду да мора; магчымасці аўт. развіцця нетурэцкіх частак Асманскай імперыі, адкрыццё праліва Дарданелы для суднаў усіх краін; стварэнне польскай дзяржавы; арганізацыя *Лігі Нацый*. Пасля вайны шэраг палажэнняў «Ч.п.» Вільсана рэалізаваны ў *Версальскім мірным дагаворы 1919* і інш. дагаворах *Версальска-Вашынгтонскай сістэмы*.

ЧАТЫРОХГАДО́ВЫ СОЙМ 1788—92, доўгатэрміновая дзейнасць заканадаўчага органа Рэчы Паспалітай — Вялікага сойма, які спрабаваў рэфармаваць грамадска-паліт. лад дзяржавы на глебе асветніцкіх ідэй. Рыхтаваўся ва ўмовах сканчэння тэрміну саюзнага дагавора 1764 з Расіяй і з надзеяй прагрэс. колаў на карэнную змену існуючага ладу без рас. апекі. Адкрыўся ў Варшаве 6.10.1788 у прысутнасці каля 150 паслоў (дэпутатаў). Маршалкі — рэферэндар каронны С.Малахоўскі і ген. артылерыі ВКЛ К.Н.Сапега. Каб рашэнні маглі прымацца большасцю галасоў, сойм абвясціў сябе *канфедэрацыяй*. Адразу зарыентаваўся на дапамогу Прусіі, 29.3.1790 заключыў з ёю абарончы саюз, які гарантаваў тэр. цэласнасць і ўзаемадапамогу. Сойм без уліку магчымасцей краіны 20.10.1788 пастанавіў павялічыць войска да 100 тыс. чал. і падпарадкаваў яго навастворанай Камісіі вайсковай абодвух народаў. 19.1.1789 скасаваў *Пастаянную раду* як сімвал рас. пратэктарату, 23.12.1789 стварыў Стражу Правоў і падпарадкаваў сабе кантроль над знешнімі зносінамі. 7.9.1789 стварыў канстытуцыйную камісію пад кіраўніцтвам камянецкага біскупа А.Красінскага. 17.12.1789 камісія прапанавала замяніць кардынальныя правы нормамі аб суверэнітэце і непадзельнасці тэр. дзяржавы, пазбавіць немаёмную шляхту выбарчых правоў, забараніць права *ліберум вета*, канфедэрацыі, дэпутацкія наказы. 268 прадстаўнікоў ад 141 горада 24.11.1789 унеслі патрабаванне пра ўраўнаванне грамадзянскіх правоў мяшчанства са шляхтай. Да часу прыняцця канстытуцыі сойм усклаў на сябе ўсю паўнату ўлады, для чаго 17.11.1789 стварыў у ваяводствах і паветах камісіі парадкавыя цывільна-вайсковыя, а 14.6.1790 пастанавіў прадоўжыць свае сесіі да склікання чарговых соймікаў, хоць апошнія выказаліся за непарушнасць існуючага саслоўнага ладу. Прыхільнікі кардынальных змен вырашылі падрыхтаваць канстытуцыю «тайна, каб увесці яе рэвалюцыйным спосабам», быў створаны Клуб сяброў канстытуцыі. 16.12.1790 сойм прадоўжыў працу ў складзе каля 500 старых і новаабраных паслоў, 24.3.1791 прынята «Устава аб соймiках», дзе акрэслены іх тэрміны, месца і працэдура правядзення. Выбарчыя правы дадзены землеўладальнікам і тым, хто плаціў 100 злотых падатку за карыстанне чужой маёмасцю. ВКЛ падзелена на 34 паветы. 18.4.1791 прыняты законы аб гарадах пад дзярж. юрысдыкцыяй, у т.л. Брэст, Вільня, Гродна, Мінск, Навагрудак, Пінск. Гараджанам-хрысціянам прадастаўлены дарадчы голас на сойме, права выбару органаў самакіравання, шляхецкая годнасць на дзярж., ваеннай і царк. службе. У прысутнасці 157 паслоў сойм прыняў *Канстытуцыю 3 мая 1791*, якой абавязаў прысягнуць вайскоўцаў і ўсіх мясц. ураднікаў, абвясціўшы кожнага непаслушэнца ворагам айчыны і бунтаўшчыком. У чэрв. 1791 сойм пачаў кадыфікацыю цывільнага і крымінальнага права на аснове новай канстытуцыі (т.зв. Кодэкс Панятоўскага). Аднак дэлегацыя ВКЛ 29.6.1791 дамаглася кадыфікацыі права асобна для Кароны Польскай і ВКЛ (для ВКЛ — мадыфікацыі Статута 1588), роўнага прадстаўніцтва абедзвюх частак дзяржавы ў цэнтр. органах улады. Замест прыняцця праекта агульнага вызвалення сялян ад прыгоннай залежнасці сойм 19.12.1791 пастанавіў распрадаць дзярж. староствы па частках або пакінуць іх ранейшым пасэсарам на розныя тэрміны трымання за выкуп з папярэднім акрэсленнем сял. павіннасцей і абавязкаў бакоў. Гэта спарадзіла барацьбу сялян супраць запрыгоньвання, а кароль 2.8.1791 загадаў падаўляць хваляванні ўзбр. сілай. 11.7.1789 сойм спрабаваў злучыць каталіцкую і уніяцкія цэрквы ў адну, канфіскаваў маёмасць Кракаўскага архібіскупства, перавёў каталіцка-уніяцкі епіскапат на дзярж. ўтрыманне, увёў уніяцкага мітрапаліта ў Сенат (25.7.1790). 15.3.1790 абвінаваціў праваслаўных у непатрыятызме, зняволіў пераяслаўскага і барыспальскага епіскапа (са знаходжаннем у Слуцку) В.Садкоўскага і намагаўся стварыць незалежную ад Масквы правасл. іерархію са сваім сінодам, для чаго склікаў Пінскую кангрэгацыю 1791. 3.1.1792 сойм прыняў закон аб зямянскіх судах з выбарам іх членаў, дэпутатаў, камісараў і ўраднікаў на 4 гады мясц. соймікамі. Першыя выбары разам з новай прысягай канстытуцыі адбыліся 24.2.1792. Рэзкасць, палавінчатасць і павярхоўны характар рэформ спарадзілі грамадскі раскол, што выкарысталі апазіцыя і Расія, якія стварылі *Таргавіцкую канфедэрацыю*. Прусія адраклася ад саюзніцкай дапамогі Рэчы Паспалітай. У абставінах знешнепаліт. ізаляцыі і ўмяшання Расіі сойм увёў у краіне ваеннае становішча, стварыў соймавы суд над праціўнікамі канстытуцыйнага ладу, забараніў канфедэрацыі і права магнатаў мець больш за 40 чал. уласнага войска. 29.5.1792 сойм прыпыніў сваю дзейнасць, але з-за паражэння ў вайне больш не сабраўся.

Я.К.Анішчанка.

ЧАТЫРОХНО́ГІЯ КЛЯШЧЫ́, гл. *Галавыя кляшчы*.

ЧАТЫРОХПРАМЯНЁВЫЯ КАРА́ЛЫ (Tetracorallia), р у г о з ы (Rugosa), падклас вымерлых беспазваночных жывёл кл. каралавых паліпаў тыпу кішачнаполасцевых. Некалькі атр., 300—330 родаў. Жылі ад позняга кембрыю да канца пярмі на марскіх мелкаводдзях, прырас-



Будова шкілета **чатырохпрамянёвых каралаў**.

талі да падводных прадметаў або свабодна ляжалі на дне. На Беларусі пашыраны на Пн, ПнЗ, ПдЗ і ПдУ. Па выкапнёвых рэштках вызначаюць узрост геал. адкладаў.

Адзіночныя або каланіяльныя паліпы з вонкавым вапняковым шкілетам. Адзіночныя рогападобнай, цыліндрычнай або прызматычнай формы, каланіяльныя — кусцістай і масіўнай. Унутр. шкілет складаўся з верт. (септ) і гарыз. (днішчаў) перагародак. У адрозненне ад сучасных шасціпрамянёвых каралаў рыфаў не ўтвараліе.

ЧАТЫРОХРАДКО́ЎЕ, катрэн, у паэзіі страфа з 4 вершаваных радкоў. Існуюць розныя віды рыфмоўкі: аабб, ааба, абба, аааа, абаб:

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.
(Я.Купала. «Спадчына»)

Структура Ч. валодае вял. рытмічнымі, сінтакс. і інтанацыйнымі магчымасцямі, рознымі чаргаваннямі *клаўзул* (мужчынскіх, жаночых, дактылічных, гіпердактылічных).

У бел. л-ры — пануючая форма строфікі. Ужываецца самастойна і ў складзе больш буйных форм (санет, васьмірадковік). Сустракаецца ў стараж. бел. л-ры (напр.,, «Дыярыуш» Афанасія Філіповіча). *В.П.Рагойша.*

ЧАТЫРОХХЛО́РЫСТЫ ВУГЛЯРО́Д, тэтрахлорметан, фрэон 10, хладон 10, CCl_4, бясколерная вадкасць, растваральнік тлушчаў, воскаў, лакаў, палімераў, сыравіна для атрымання *хладонаў*.

Т-ра плаўлення -22,90 °С, $t_{кіп}$ 76,75 °С, хімічна інертны, выбухова- і пажаранебяспечны. Ядавіты, разбурае азонавы слой; ГДК у атм. паветры 2 мг/м^3.

«ЧАТЫ́РЫ МАСТА́ЦТВЫ», аб'яднанне рас. мастакоў у 1924—31 у Маскве. Засн. б. членамі «*Свету мастацтва*» і «Блакітнай ружы». У яго ўваходзілі Г.Астравумава-Лебедзева, Л.Бруні, І.Жалтоўскі, А.Краўчанка, П.Кузняцоў, А.Мацвееў, В.Мухіна, К.Пятроў-Водкін, М.Сар'ян, У.Фаворскі, А.Шчусеў, І.Яфімаў і інш. Іх творчасці ўласцівы імкненне да высокага прафес. майстэрства, вобразнае абагульненне і выразная дэкаратыўнасць. Арганізавала выстаўкі ў Маскве (1925, 1926, 1929), Ленінградзе (1928).

ЧАЎ-ЧАЎ, парода дэкаратыўных сабак з групы *шпіцаў*. Выведзена ў старажытнасці ў Кітаі для палявання на буйных звяроў, таксама дзеля мяса і футра. Гадуюць сабакаводы-аматары ва ўсім свеце.

Масіўныя, моцнага целаскладу, квадратнага фармату. Выш. ў карку 46 см і больш. Галава вялікая, морда кароткая, грудзі шырокія. Язык чорны. Хвост загнуты кольцам на спіне. Шэрсць прамая, з моцна развітай поўсцю, асабліва доўгая на шыі, лапах, хвасце. Масць аднародная рыжая розных адценняў, чорная, шэрая, белая.

ЧАЎДА́Р Лізавета Іванаўна (23.2.1925, г. Адэса, Украіна — 1989), украінская спявачка (каларатурнае сапрана), педагог. Нар. арт. СССР (1952). Скончыла Адэскую кансерваторыю (1948). У 1948—73 салістка Укр. т-ра оперы і балета, адначасова з 1968 выкладала ў Кіеўскай кансерваторыі (з 1979 праф.). Валодала моцным, прыгожым па тэмбры голасам, майстэрствам вак. інтэрпрэтацыі. Першая выканальніца партый Аксаны, Іалан, Ярыны («Тарас Шаўчэнка», «Мілана», «Арсенал» Г.Майбарады). Сярод інш. партый: Антаніда, Людміла («Іван Сусанін», «Руслан і Людміла» М.Глінкі), Марфа («Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава), Мюзета («Багема» Дж.Пучыні) і інш.

ЧАЎДЗІ́НСКІ БАСЕ́ЙН (ад назвы мыса Чаўда на Керчанскім п-ве), саленаватаводны азёрна-марскі басейн, што існаваў на месцы сучаснага Чорнага м. ў раннім плейстацэне.

«ЧАЎНО́ЧНЫЯ» АПЕРА́ЦЫІ, баявыя дзеянні амер. авіяцыі ў 2-ю сусв. вайну з выкарыстаннем авіябаз (аэрадромаў) СССР, Вялікабрытаніі, Італіі і Паўн. Афрыкі. Самалёты, якія выляталі з аэрадромаў Вялікабрытаніі або Італіі, наносілі ўдары па аб'ектах праціўніка, працягвалі палёт і прызямляліся на аэрадромах Паўн. Афрыкі або СССР. Пасля тэхн. абслугоўвання і запраўкі самалёты на зваротным шляху выконвалі новую баявую задачу. Першая «Ч.»а. з аэрадромаў Італіі і пасадкай самалётаў на палтаўскі аэрадромны вузел (аэрадромы Палтава, Міргарад, Пірацін, Украіна) праведзена 2.7.1944 і ў зваротным напрамку — 6.7.1944. З 2 чэрвеня па 19.9.1944 на сав. авіябазах абслужана 1030 амер. самалётаў, якія здзейснілі 2207 баявых вылетаў. На 13 буйных аб'ектаў праціўніка скінута каля 2 тыс. т бомбаў. У канцы вер. 1944 неабходнасць у «Ч.»а. адпала (сав. войскі прасунуліся на З, а саюзныя на У).

ЧА́ЎНСКАЯ ГУБА́, заліў каля ўсх. берагоў Усх.-Сібірскага м., злучаецца з ім пралівамі Сярэдні і М.Чаўнскі. Даўж. 150 км, шыр. 100 км, глыб. да 25 м. У вусці — в-аў Аён. Упадае шмат дробных рэк. Летам з высокіх шырот наносяцца шматгадовыя льды, што ўтвараюць каля ўваходу ў губу т.зв. Аёнскі ледзяны масіў Норт-Певек.

Чау-чау.

ЧАЎЧАВА́ДЗЕ Аляксандр Гарсеванавіч (1786, С.-Пецярбург — 18.11.1846), грузінскі грамадскі дзеяч, паэт. Князь. Скончыў Пажскі корпус у Пецярбургу (1809). З 1814 на высокіх ваен.-адм. па-

І.Р.Чаўчавадзе.



З.Б.Чаховіч.

садах у Грузіі. За ўдзел у змове дваран Грузіі супраць Расіі ў 1832 сасланы. У 1834 вярнуўся ў Грузію. З 1843 займаўся літ. і грамадскай дзейнасцю. Пачынальнік рамантызму ў груз. паэзіі. Асн. тэмы творчасці: любоў да радзімы (вершы «Возера Гакча», «Каўказ»), каханне (многія вершы пакладзены на музыку), рыцарскія традыцыі прашчураў. На бел. мову асобныя яго творы пераклаў А.Звонак.

ЧАЎЧАВА́ДЗЕ Ілья Рыгоравіч (8.11.1837, с. Кварэлі, Грузія — 12.9.1907), грузінскі пісьменнік, грамадскі дзеяч. Вучыўся ў Пецярбургскім ун-це (1857—61). Працаваў суддзёй і інш., быў старшынёй Т-ва пашырэння пісьменнасці сярод грузін, праўлення Груз. драм. т-ва. Чл. Дзярж. савета (1906). Адзін з заснавальнікаў (з А.*Цэрэтэлі*) груз. рэв.-дэмакр. плыні 1860—70-х г. «Цергдалеўлебі». Літ. дзейнасць з 1857. Паэзія Ч. прасякнута гуманіст. матывамі, грамадз. пафасам. Пісаў вершы-замалёўкі роднай прыроды. У паэме «Пустэльнік» (1883) тэма грамадз. служэння. Саслоўна-класавыя супярэчнасці груз. грамадства ў паэмах «Здань» (1859, апубл. 1872—73), «Некалькі малюнкаў, або Выпадак з жыцця разбойніка» («Разбойнік Како», 1860), аповесцях «Ці ж ён чалавек?» (1859—63), «Апавяданне жабрака» (1859, апубл. 1873). Аповесць «Атарава ўдава» (1887) пра жыццё вёскі пасля адмены прыгоннага права. На бел. мову асобныя яго творы пераклаў Х.Жычка.

Тв.: Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—2. Тбилиси, 1978; Стихотворения и поэмы. Л., 1979.

ЧАЎШЭ́СКУ (Ceauşescu) Нікалае (26.1.1918, с. Скарнічэшці, пав. Олт, Румынія — 25.12.1989), дзяржаўны і паліт. дзеяч Румыніі. Чл. Рум. камуніст. партыі

(РКП) з 1933. З 1939 сакратар Бухарэсцкага гаркома рум. камсамола ў падполлі, у 1939—40 — чл. Цэнтр. камісіі па рабоце сярод моладзі пры ЦК РКП і сакратар ЦК камсамола. У 1940 арыштаваны ваен.-фаш. рэжымам і да 1944 знаходзіўся ў турмах і канцлагеры. З 1944 на кіруючых камсамольскіх, парт. і дзярж. пасадах, канд. у члены (з 1945), чл. (з 1948) ЦК РКП, чл. Палітбюро ЦК РКП (з 1955); карыстаўся падтрымкай і апекай ген. сакратара ЦК РКП Г.*Геаргіў-Дэжа*, ад якога пераняў многія метады кіраўніцтва і апаратнай барацьбы. З 1954 сакратар, з сак. 1965 1-ы сакратар, з ліп. 1965 ген. сакратар ЦК РКП, са жн. 1969 ген. сакратар РКП. Са жн. 1967 Старшыня Дзярж. савета, з 1968 старшыня Фронту дэмакратыі і сацыяліст. адзінства, з 1969 старшыня Савета абароны і вярх. галоўнакамандуючы ўзбр. сіламі, з 1973 старшыня Вышэйшага савета эканам. і сац. развіцця, з сак. 1974 прэзідэнт Румыніі. Працягваў «асобы курс» Геаргіў-Дэжа [фарсіраваная індустрыялізацыя, незалежная ад СССР знешнепаліт. лінія (добрыя адносіны з Кітаем, няўдзел ва ўводзе войск Арг-цыі Варшаўскага дагавора ў ЧССР у 1968, захаванне дыпламат. адносін з Ізраілем пасля 1967 і Чылі пасля 1973 і інш.), інтэнсіўныя эканам. сувязі з капіталіст. краінамі]. З дапамогай апаратных інтрыг і рэпрэсій да пач. 1970-х г. засяродзіў у сваіх руках усю паўнату улады, прыцягваў да кіравання сваіх родных і сваякоў, паступова складваўся культ яго асобы. Нягледзячы на поспехі ў пачатковы перыяд дзейнасці Ч. на пасадзе кіраўніка партыі і дзяржавы, да пач. 1980-х г. пачалі нарастаць негатыўныя тэндэнцыі ў забеспячэнні грамадзян харч. і прамысл. тавара́мі. У пач. 1989 поўнасцю ліквідаваў знешнюю запазычанасць Румыніі за кошт рэзкага зніжэння ўзроўню дабрабыту насельніцтва, што выклікала масавую незадаволенасць у краіне. У час снежаньскіх падзей 1989 арыштаваны і разам з жонкай Аленай расстраляны па прыгаворы ваен. трыбунала.

Тв.: Рус. пер. — Избр. произв., 1982—1986 гг. М., 1987.

Літ.: Шевелев В.Н. Диктаторы и боги. Ростов н/Д, 1999. *А.А.Ляўшэвіч.*

ЧАХАЎСКО́Й Якаў Аўраамавіч (псеўд. Якуб, Якуба; 30.12.1879, г. Гродна — 31.7.1941), бел. атлет і барэц. Скончыў Гродзенскую мужчынскую класічную гімназію (1898). Служыў у Гродзенскім гусарскім палку (з 1902, Варшава). Пасля заканчэння службы выступаў (1908—15) у барцоўскіх паядынках у цырках Расіі пад псеўд. Ічаджы. У 1913 атрымаў міжнар. прыз (ганаровы залаты пояс) за рэкордны нумар — перанос на адной руцэ 6 чал. (больш за 400 кг). Выконваў такія практыкаванні, як утрыманне на сабе памоста з аркестрам у 30 чал., падкідванне і прыманне на грудзі 2-пудовых (32 кг) гір, у стойцы «барцоўскі мост» трымаў на сабе 10 чал., 3 з якіх сядзелі на штанзе масай 160 кг, што знаходзілася ў выцягнутых руках атлета (агульная маса каля 900 кг), прапускаў цераз сябе па памосце грузавы аўтамабіль з 20 пасажырамі і інш. З 1918 нам. старшыні Усерас. саюза барцоў-атлетаў. Член рэд. савета час. «Борец-атлет» (Петраград) — першага сав. спарт. выдання. З 1919 выкладчык-інструктар спарт. клуба Петраградскай ваен. акругі. У 1920—26 меў шмат паказальных выступленняў на спарт. і інш. пляцоўках Петраграда. Летам 1937 выступаў з паказальнай праграмай на мінскім стадыёне «Дынама». Сярод вучняў Ч. — рэкардсмены свету і СССР па цяжкай атлетыцы М.Буйніцкі, А.Пятроў і інш.

Літ.: Мядзведзеў М.Н., Чэхаўской Д.Я. Асілак Якуба: Пер. з рус. Мн., 1991. *А.М.Петрыкаў.*

ЧАХЕ́ЦКІ СЯДЗІ́БНА-ПА́РКАВЫ АНСА́МБЛЬ, помнік архітэктуры і садова-паркавага мастацтва сярэдзіны 19 ст. ў б. маёнтку Чахец (цяпер в. Каштанаўка

Чахецкі сядзібна-паркавы ансамбль. Сядзібны дом. Фота 1939.

Пружанскага р-на Брэсцкай вобл.). У 1853—1939 належаў памешчыку А.Ф.Кернажыцкаму і яго нашчадкам па жаночай лініі Дзяконскім (з 1873). Мураваны сядзібны дом складаецца з 2 аб'ёмаў, мае рысы позняга класіцызму. Гал. аб'ём 1-павярховы, у плане выцягнуты прамавугольнік, пад 2-схільным дахам. Уваход афармлены 4-калонным порцікам. З боку паркавага фасада тэраса. Справа да гал. аб'ёму прымыкае 2-павярховы корпус. Дом моцна пашкоджаны. Парк (пл. 12 га) пейзажнага тыпу на раўнінным рэльефе. Перад домам партэрная ч. парку, за ім — ландшафтная, заканчваецца вадаёмам. Пераважаюць мясц. пароды дрэў, з экзотаў растуць хвоя веймутава, вяз амерыканскі, лістоўніца сібірская, бук лясны. Ансамбль знаходзіцца на тэр. Пружанскага агр.-тэхн. каледжа.

Літ.: Антипов В.Г. Парки Белоруссии. Мн., 1975; Федорук А.Т. Садово-парковое искусство Белоруссии. Мн., 1989; Aftanazy R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. 2 wyd. Wrocław etc., 1992. T. 2. S. 31—32. *Ю.В.Бажэнаў.*

ЧАХО́ВІЦ Марцін (ліст. 1632, г. Збоншынь, Польшча — ліст. 1613), тэолаг і пісьменнік-палеміст, ідэолаг левага крыла радыкальна-рэфармацыйнага руху ў ВКЛ і Польшчы. Вучыўся ў Лейпцыгскім ун-це. З 1559 настаўнік пратэстанцкай школы ў Вільні. З пач. 1560-х г. прыхільнік і прапагандыст анабаптызму і антытрынітарызму. Быў прапаведнікам у кальвінісцкім зборы, удзельнічаў у сінодах бел. і літ. *антытрынітарыяў*. Пад націскам кальвіністаў і гар. магістрата ў 1565 выехаў у Польшчу, жыў у Куявіі ў маёнтку аднадумца Я.Немаеўскага, з якім арганізаваў антытрынітарскую суполку, потым пераехаў з ім у Люблін і ўзначаліў антытрынітарскую суполку. У 1581 у мяст. Лоск (каля г. Валожын) вёў палеміку з С.*Будным* і В.*Цяпінскім*. Лічыў веру асабістай справай чалавека, патрабаваў рэліг. верацярпімасці, выступаў супраць прыгонніцтва, *Контррэфармацыі* і езуітаў, адмаўляў свецкую ўладу і войны. Этыка Ч. грунтавалася на прынцыпах евангельскага вучэння і запаветаў Ісуса Хрыста. Аўтар твораў «Хрысціянскія размовы» (1575), «Пра паходжанне памылак дзетахрышчэнцаў» (1582) і інш.

Літ.: Подокшин С.А. Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы: (Вторая половина XVI — нач. XVII в.). Мн., 1970. *С.А.Падокшын.*

ЧАХО́ВІЧ (Чаховіч-Ляхавіцкі) Зыгмунт Бярнардавіч (19.8.1831, в. Сурвілішкі Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. — 27.10.1907), адзін з кіраўнікоў *паўстання 1863—64* на Беларусі і ў Літве. Скончыў Віленскі дваранскі ін-т (1851), вучыўся ў Пецярбургскім ун-це. Дэмакрат, прыхільнік партыі «чырвоных». У 1862—63 чл. *Літоўскага правінцыяльнага камітэта*, паплечнік К.Каліноўскага па падрыхтоўцы і кіраўніцтве паўстаннем. Пасля ліквідацыі к-та экспедытар (загадваў канспіратыўнымі сувязямі) пры *Аддзеле кіраўніцтва правінцыямі Літвы* і *Выканаўчым аддзеле Літвы*. 31.7.1863 арыштаваны і засуджаны на 12 гадоў катаргі, якую адбываў у Нерчынскіх рудніках. Пасля жыў у маёнтку Бясяды Вілейскага пав. (цяпер Лагойскі р-н), дзе з ім пазнаёміўся і карыстаўся яго вял. бібліятэкай малады Я.Купала. Вобраз Ч. гэтага перыяду адлюстраваны ў п'есе У.Караткевіча «Каліска чатырох чараўніц».

Літ.: Киселев Г. Бесядские пути-дороги // Неман. 1984. № 3. *Г.В.Кісялёў.*

ЧАХО́ВІЧ Кароль (13.9.1832, каля г. Каўнас, Літва — 4.6.1902), расійскі фізік, прыродазнавец і педагог бел. паходжання. Скончыў Казанскі ун-т (1857). З 1859 працаваў у Шляхецкім ін-це ў Вільні, з 1864 у Беластоцкай гімназіі. Разам з М.М.*Гусевым* выдаваў час. «Вестник математических наук» (1861—63). З 1884 акр. інспектар навуч. устаноў у Арэнбургу. Навук. даследаванні па электрычнасці, магнетызме, оптыцы і спектраскапіі, методыцы фіз. доследаў. Сканструяваў некалькі арыгінальных прылад, якія адзначаны на ўсерасійскіх з'ездах прыродазнаўцаў і выстаўках. Арганізаваў геал., геад. і этнагр. даследаванні ў Арэнбургскім краі. Праводзіў сістэм. метэаралагічныя назіранні, выказаў меркаванні аб сувязі змен надвор'я з цыкламі сонечнай актыўнасці.

Літ.: Процька Т.С. Эксперыментатар з Беластоцкай гімназіі: Кароль Чаховіч. Мн., 1990. *П.Г.Космач.*

ЧАХО́ВІЧ (Czechowicz) Шыман (Сымон) (хрышчаны 22.7.1689, г. Кракаў, Польшча — 21.7.1775), польскі мастак. Вучыўся маляваць у Рыме. Пісаў партрэты, абразы, займаўся манум. жывапісам. Выкарыстоўваў іканаграфічныя кампазіцыі Рафаэля, фламандскіх мастакоў (у т.л. П.П.Рубенса, А. ван Дэйка). Працаваў у Польшчы, Літве, на Украіне і Беларусі. Каля 1770 выканаў 44 карціны для езуіцкага калегіума ў г. Полацк Віцебскай вобл. Верагодна, удзельнічаў у стварэнні размалёвак Нясвіжскага касцёла Божага Цела.

Літ.: Orańska J. Szymon Czechowicz, 1689—1775. Poznań, 1948. *В.Дз.Бажэнава.*

ЧАХО́НЬ (Pelecus cultratus), рыба сям. карпавых. Пашырана ў прэсных і салаватых водах у бас. Азоўскага, Аральскага, Балтыйскага, Каспійскага і Чорнага мораў. На Беларусі трапляецца ў р. Дняпро і яго прытоках: Прыпяць, Сож, Бярэзіна, Друць. Нар. назвы чахоня, шабля, каза, чэшка, селядзец.

Чахонь.

Даўж. да 50 см, маса 500—600 г, зрэдку да 2 кг. Афарбоўка светла-серабрыстая, спіна цёмна-бурая. Цела прадаўгаватае, сціснутае з бакоў. Бруха пукатае, завостранае. Бакавая лінія зігзагападобная. Галава тупая, рот верхні. Спінны плаўнік кароткі, хваставы выемчаты. Паўпрахадныя і жылыя формы. Пелагічная, чародная рыба. Корміцца беспазваночнымі і дробнай рыбай. Аб'ект промыслу.

ЧАХО́ЎСКІ Іван Аляксандравіч (н. 25.7.1928, в. Рыбцы Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне гігіены. Д-р мед. н. (1984), праф. (1985). Скончыў Бел. мед. ун-т (1951), дзе і працуе з 1957 (у 1973—94 заг. кафедры). Навук. працы па выпрацоўцы метадаў ацэнкі якасці харч. збожжа.

Тв.: Использование удобрений и качество белка пшеницы. Мн., 1981; Биологическая оценка белка пшеницы при различном содержании азота в минеральных удобрениях. Мн., 1985.

ЧАХО́ЎСКІ Крыстоф, бел. майстар маст. ліцця 18 ст. Жыў у г. Жлобін Гомельскай вобл., працаваў на мясц. ліцейным з-дзе. Адліваў гарматы, упрыгожаныя арыгінальнымі ўзорамі, выявамі гербаў і інш.

Літ.: Каханоўскі Г.А. Жлобінскія гарматы XVIII ст. // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1976. № 4.

ЧАХО́ЎСКІ Леанід Станіслававіч (н. 28.4.1937, Мінск), бел. артыст балета. Засл. арт. Беларусі (1967). Скончыў Бел. харэаграфічнае вучылішча (1955). З 1957 саліст Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі, з 1977 выкладчык Бел. харэагр. вучылішча, у 1995—98 педагог-рэпетытар Дзярж. т-ра муз. камедыі Беларусі. Для яго выканальніцкай манеры характэрны пластычная выразнасць, драм. асэнсаванасць, дакладнасць псіхал. характарыстык: Князь, Хуан, Іван («Выбранніца», «Мара», «Альпійская балада» Я.Глебава), Спартак, Гармодзій («Спартак» А.Хачатурана), Лені («Сцежкаю грому» К.Караева), Эспада («Дон Кіхот» Л.Мінкуса), Пер Гюнт («Пер Гюнт» на муз. Э.Грыга), Тыбальд («Рамэо і Джульета» С.Пракоф'ева), Гірэй («Бахчысарайскі фантан» Б.Асаф'ева), Ротбарт («Лебядзінае возера» П.Чайкоўскага), Кален («Марная засцярога» П.Л.Гертэля). *Дз.М.Жураўлёў.*

ЧАХО́ЎСКІ Міхаіл Іосіфавіч (1763 — пасля 1825 ?), бел. архітэктар; прадстаўнік класіцызму. З 1804 працаваў у Мінску, у 1817—25 Мінскі губ. архітэктар. Аўтар праектаў урадавай установы, павятовага і ніжнята земскага судоў у г. Чэрвень (1803—06), устаноў гар. праўлення ў гарадах Мазыр (1804), Вілейка, Бабруйск, Слуцк, Пінск (усе 1806), Барысаў (1817), дома гараднічага ў Пінску (1806), моста цераз р. Свіслач у Мінску (1812), дваранскага дома ў Бабруйску (1814) і інш. Сярод інш. работ: буд-ва духоўнай семінарыі (з А.Мельнікавым) і дома К.Шэмета па вул. Францысканскай (1803), праект частковай рэканструкцыі Мінскай Петрапаўлаўскай царквы (1824) у Мінску.

В.Ф.Марозаў.

ЧАЦВЕРЫКО́Ў Віталь Паўлавіч (16.8.1933, г. Алматы, Казахстан — 26.8.1983), бел. кінарэжысёр. Засл. дз. маст. Беларусі

В.П.Чацверыкоў.

(1974). Нар. арт. Беларусі (1979). Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1962). Працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм». Для яго творчай манеры характэрна імкненне да маст. асэнсавання дакумент. фактаў, эпічнага адлюстравання рэчаіснасці, выкарыстанне экспрэсіўных маст. сродкаў. Зняў дакумент. фільмы «Высокае напружанне» (1964), «Беларуская рапсодыя» (1965), «Пакараны смерцю ў сорак першым» (1967), «Мне хацелася расказаць» (1969) і інш. Стварыў маст. эпічныя фільмы пра падзеі Вял. Айч. вайны «Руіны страляюць...» (1971, тэлевізійны) і «Полымя» (1974, гал. прэмія 8-га Усесаюзнага кінафестывалю ў Кішынёве 1975), у якіх ігравыя эпізоды спалучаны з кадрамі кінахронікі і архіўных дакументаў. Сярод інш. фільмаў: «Саша-Сашачка» (1967), «Час-Не-Чакае» (1976), «Чорная бяроза» (1978), «Паводка» (1981), «Зацішша» (1982, тэлевізійны), «Сад» (1983). Дзярж. прэмія Беларусі 1974.

Л.М.Зайцава.

ЧАЦВЕРЫКО́Ў Сяргей Сяргеевіч (6.5.1880, Масква — 2.7.1959), расійскі вучоны ў галіне генетыкі; адзін з заснавальнікаў папуляцыйнай генетыкі. Праф. (1938). Скончыў Маскоўскі ун-т (1906), з 1917 у ім працаваў, адначасова (1921—29) — у Ін-це эксперым. біялогіі (заг. аддзела). У 1935—48 у Горкаўскім ун-це (заг. кафедры). Навук. працы па тэорыі эвалюцыі, зоагеаграфіі і энтамалогіі. Заклаў фундамент папуляцыйнай генетыкі, сфармуляваў яе асн. палажэнні (1926).

Тв.: О некоторых моментах эволюционного процесса с точки зрения современной генетики // Классики советской генетики. Л., 1968.

ЧАЦВЁРТАЯ РЭСПУ́БЛІКА, рэспубліканскі дзярж. лад у Францыі ў 1946—58 (фактычна з 1944). Усталявалася пасля вызвалення Францыі ад ням.-фаш. захопнікаў (1944). У 1944—46 існаваў т.зв. часовы рэжым, з 24.12.1946 дзейнічала канстытуцыя, якая ўвяла ў краіне рэжым *парламенцкай рэспублікі* з абмежаванымі правамі прэзідэнта. Ч.р. вызначалася паліт. нестабільнасцю (змяніўся 21 урад). Спыніла існаванне пасля ўвядзення па ініцыятыве Ш. дэ *Голя* канстытуцыі *Пятай рэспублікі* (13.10.1958).

ЧАЦВЁРТЫ З'ЕЗД КП(б)Б [XI канферэнцыя КП(б)Б]. Адбыўся ў Мінску 25.2—2.3.1921 (паводле некат. крыніц завяршыў работу 1.3.1921). Прысутнічала 110 дэлегатаў з рашаючым і 42 з дарадчым голасам ад 6 павятовых арг-цый і армейскіх часцей, што размяшчаліся на тэр. ССРБ. Яны прадстаўлялі 3000 чл. партыі. Парадак дня: справаздачы ЦК КП(б)Б (І.А.Вайнер), Рэвіз. камісіі КП(б)Б, Кантрольнай камісіі КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ (Кузняцоў); даклады: Сацыяліст. рэспубліка ў капіталіст. акружэнні (А.Р.Чарвякоў); прафсаюзы, іх роля і задачы; пытанні парт. будаўніцтва (В.Г.Кнорын); міліцыйная сістэма і Чырв. Армія; Галоўпалітасвета і агітац.-прапагандысцкая работа (Кнорын); выбары. З'езд адзначыў неабходнасць умацавання сав. улады ва ўмовах капіталіст. акружэння, наладжвання больш цеснай работы парт. арг-цый з саюзамі моладзі і ўсямернай дапамогі ім. Асаблівая ўвага звернута на ўмацаванне парт. дысцыпліны, абавязковасць для «ўсіх арганізацый бясспрэчна кіравацца Статутам, дакладна і своечасова выконваць усе распараджэнні ЦБ». З'езд канстатаваў, што Чырв. Армія працягвае заставацца апорай сав. улады, але яна павінна быць рэарганіза-

вана, колькасна скарочана і якасна палепшана. Асн. задачай Галоўпалітасветы павінна стаць «масавая камуністычная прапаганда і агітацыя»; усе паліт.-асв. аддзелы пры наркаматах падлягалі скасаванню. Гал. рашэнні з'езда прымаліся на аснове матэрыялаў, распрацаваных у ЦК РКП(б) і апублікаваных як праекты рэзалюцый X з'езда РКП(б). У іх праглядаецца курс на барацьбу з апазіцыяй і іншадумствам у партыі. З'езд выбраў ЦК КП(б)Б з 11 чл. і 4 канд. у чл., Кантрольную камісію з 3 чл. і 2 канд. у чл., Рэвіз. камісію з 3 чл. і 2 канд. у чл., 5 дэлегатаў з рашаючым і 5 з дарадчым голасам на X з'езд РКП(б).

Літ.: Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии. Ч. 2 (1921—1966). Мн., 1967; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 1. 1918—1927. Мн., 1983.

В.Ф.Кушнер.

ЧАЦВЁРТЫ ІНТЭРНАЦЫЯНА́Л, гл. *«Інтэрнацыянал 4-ы»*.

ЧАЦВЁРТЫ УСЕБЕЛАРУ́СКІ З'ЕЗД САВЕ́ТАЎ рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Адбыўся 14—18.12.1922 у Мінску; 250 дэлегатаў з рашаючым і 43 з дарадчым голасам (паводле інш. звестак адпаведна 226 і 24). Парадак дня: аб дзейнасці ўрада ССРБ (А.Р.Чарвякоў); аб утварэнні СССР (Чарвякоў); прыняцце і зацвярджэнне Канстытуцыі СССР (РСФСР, Украіны, Беларусі, ЗСФСР); аб становішчы нар. адукацыі (А.В.Баліцкі, У.М.Ігнатоўскі, У.І.Пічэта, А.Т.Кірсанаў); аб рабоце Наркамзема (А.С.Славінскі); аб харчпадатку (І.А.Адамайціс); аб рабоце Наркамфіна (С.Я.Талунціс); аб рэарганізацыі сав. дзярж. апарату (В.А.Нодэль); даклады Прэзідыума СНГ ССРБ аб становішчы прам-сці (А.С.Карпешын), Цэнтрабелсаюза аб кааперацыі (Я.Л.Дыла); судовы лад; выбары ЦВК БССР і дэлегатаў на 10-ы Усерас. з'езд Саветаў. З'езд падкрэсліў значэнне адзінства сав. рэспублік у барацьбе за ўсталяванне новага ладу і ўзмацненне братэрскіх сувязей працоўных усіх рэспублік, падтрымаў ідэю добраахвотнага і раўнапраўнага аб'яднання рэспублік у адзінай дзяржаве, зацвердзіў асн. пункты Канстытуцыі Саюза ССР, якія былі ўхвалены ЦК РКП(б) яшчэ 30.11.1922. Асаблівая ўвага звернута на аднаўленне сельскай гаспадаркі і прам-сці рэспублікі. Канстатавалася ў асн. станоўчая дынаміка развіцця нар. гаспадаркі ССРБ у 1921—22, адначасова падкрэсліваліся крызісныя моманты ў параўнанні з дарэв. часам. З'езд выбраў ЦВК БССР, 27 дэлегатаў на 10-ы Усерас. з'езд Саветаў. 18.12.1922 на 1-й сесіі ЦВК БССР выбраны Прэзідыум ЦВК з 7 чл. і СНК БССР з 15 чл.

Літ.: Доклад правительства ССР Белоруссии 4-му Всебелорусскому съезду Советов: [Стеногр. отчет]. Мн., 1922.

І.Г.Яцкевіч.

ЧАЦВЯРНА́Я РЫ́ФМА, рыфма, якая спалучае 4 суседнія вершаваныя радкі. Сустракаецца ў фальклоры:

Малады чумак, чаго **зажурыўся**,
Ці валы прысталі, ці з дарогі **збіўся**?
Валы не прысталі, з дарогі не **збіўся**.
Таго зажурыўся — без долі **ўрадзіўся**.

Найчасцей спалучае радкі катрэнаў (4-радкоўяў):

Сам не знаю, як **дамоў**
Я з гармонікам **дайшоў**,
Як ён сцежкай мяне **вёў**,
Па якой пайшла **любоў**.
(М.Танк. «Цёмны месяц»)

Ужываецца ў 5-радковых і 6-радковых строфах. Можа выкарыстоўвацца ва ўсіх строфах паэт. твора. *А.А.Майсейчык.*

ЧАЦВЯРНО́Е ПАГАДНЕ́ННЕ, найменне блока Вялікабрытаніі, Францыі, Расіі і Італіі, які ў 1-ю сусв. вайну 1914—18, разам з інш. дзяржавамі процістаяў *Чацвярному саюзу*. Склаўся ў выніку далучэння да *Антанты* ў 1915 Італіі, якая раней ўваходзіла ў *Траісты саюз 1882*.

ЧАЦВЯРНЫ́ САЮ́З, найменне блока Германіі, Аўстра-Венгрыі, Турцыі і Балгарыі, які ў 1-ю сусв. вайну 1914—18 процістаяў краінам *Чацвярнога пагаднення* і іх саюзнікам. Склаўся пасля далучэння Турцыі ў 1914 і Балгарыі ў 1915 да Аўстра-Германскага блока, пачатак якому паклаў *Аўстра-Германскі дагавор 1879*.

ЧАЦВЯРЦІ́ЧНАЯ ГЕАЛО́ГІЯ, геалогія антрапагену, галіна *геалогіі*, якая вывучае ўтварэнні і геалагічныя падзеі антрапагенавага (чацвярцічнага) перыяду Зямлі [гл. *Антрапагенавая сістэма (перыяд)*]. Цесна звязана з геамарфалогіяй, вучэннем пра генет. тыпы кантынент. адкладаў, неатэктонікай, актуатэктонікай (вучэннем пра сучасныя тэктанічныя рухі), гляцыялогіяй, палеакліматалогіяй, палеанталогіяй, глебазнаўствам, біялогіяй, антрапалогіяй, археалогіяй, інжынернай геалогіяй, геал. карціраваннем і інш. Ч.г. выкарыстоўвае агульныя геал. метады: палеантолага-стратыграфічныя, мінералага-петраграфічныя, літалагічныя, тэктанічныя, геахім., геафіз., палеагеагр.; спец. метады: радыевугляродны, тэрмалюмінесцэнтны, крыяліталагічны, палеамагнітны, храналагічны метад даследавання стужачных глін, паліналагічны, дыятомавы аналіз, палеаантрапалагічны і археалагічны.

Асновы Ч.г. закладзены ў 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. працамі рас. вучоных Р.П.*Гельмерсена*, П.А.*Крапоткіна*, С.М.Нікіціна, А.П.Паўлава; бел. вучоных А.Э.*Гедройца*, Г.Ф.*Мірчынка*, Г.Б.*Місуны*, П.А.*Туткоўскага* і інш. У самаст. навуку вылучана ў 1920—30-я г. У 1932 створана Міжнар. асацыяцыя па вывучэнні чацвярцічнага перыяду (International Union for Quaternary research — INQUA, IHKBA). Гал кірункі даследаванняў па Ч.г.: біястратыграфічны, кліматастратыграфічны, літагенетычны, геамарфалагічны, палеагеаграфічны, палеапатамалагічны, а таксама па пытаннях неатэктонікі, маладога вулканізму і картаграфавання антрапагенавых адкладаў. Уклад у развіццё Ч.г. рабілі вучоныя: ням. П.Вольштэт; аўстр. А.Пенк, Э.Брыкнер, амер. Р.Флінт, Ф.Цэйнер; рус. А.А.Асееў, Г.С.Ганешын, І.П.Герасімаў, К.К.Маркаў, А.І.Масквіцін, Я.Я.Міланоўскі, М.І.Нікалаеў, У.М.Сукачоў, Я.В.Шанцар, М.М.Якаўлеў; бел. Л.М.*Вазнячук*, Ф.Ю.*Велічкевіч*, Г.І.*Гарэцкі*, Б.М.*Гурскі*, В.А.*Дзяменцьеў*, А.К.Карабанаў, У.А.*Кузняцоў*, К.І.*Лукашоў*, Э.А.*Ляўкоў*, Н.А.*Махнач*, А.В.*Мацвееў*, Мірчынк, В.І.*Пасюкевіч*, А.П.*Підоплічка*, А.Ф.Санько, Г.К.*Хурсевіч*, М.М.*Цапенка*, В.П.*Якушка*, Я.К.*Яловічава* і інш.

На Беларусі распрацаваны дэталёвыя стратыграфічныя шкалы, вылучаны ўтварэнні 4—6 зледзяненняў і 3—5 міжледавікоўяў, праведзена рэканструкцыя ўмоў асадканамнажэння і геал. этапаў развіцця расл. і жывёльнага свету, дэталёва ахарактарызаваны літагенетычныя комплексы адкладаў, даказана вядучая роля ледавіковых працэсаў у фарміраванні антрапагенавага покрыва краіны. Даследаванні выконваліся пераважна ў Ін-це геал. навук і Ін-це праблем выкарыстання прыродных рэсурсаў і экалогіі Нац. АН, ВА «Беларусьгеалогія», у т.л. Бел. н.-д. геалагаразведачным ін-це; БДУ і інш. ВНУ і навук. установах.

Літ.: Геология антропогена Белоруссии. Мн., 1973; Горецкий Г.И. Аллювиальная летопись великого Пра-Днепра. Мн., 1970; Лукашев К.И. Геология четвертичного периода. Мн., 1971; Махнач Н.А. Этапы развития растительности Белоруссии в антропогене. Мн., 1971.

Р.Р.Паўлавец.

ЧАЦВЯРЦІ́ЧНАЯ СІСТЭ́МА (ПЕРЫ́ЯД), тое, што *антрапагенавая сістэма (перыяд)*.

ЧАЦВЯРЫ́К у архітэктуры, чатырохвугольнае ў плане збудаванне або састаўная ч. кампазіцыі шатровых і ярусных храмаў. Вядомы са старажытнасці большасці народаў свету, найб. пашыраны ў бел., рус. і ўкр. *драўляным дойлідстве*. Чацверыком узводзілі жылыя, гасп., вытв., культавыя, грамадскія і інш. збудаванні. У сучаснай архітэк-

Да арт. **Чацвярык**. Званіца ў в. Вялец Глыбоцкага раёна Віцебскай вобл.

туры спалучэннем Ч. і *васьмерыкоў* («васьмярык на чацверыку») ствараюцца выразныя рытмічныя верт. кампазіцыі грамадз. і культавых будынкаў.

ЧА́ЦКІ (Czacki) Тадэвуш (28.8.1765, в. Паўлаўка Іванічаўскага р-на Валынскай вобл., Украіна — 8.2.1813), польскі гісторык, дзеяч асветы і навукі на тэр. ВКЛ. Атрымаў дасканалую хатнюю адукацыю. Па даручэнні караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага ўпарадкаваў частку прыватнага каралеўскага архіва і Кароннай метрыкі. У 1786—92 чл. Кароннай скарбовай камісіі. Ініцыятар складання гідраграфічнай карты Польшчы і ВКЛ. Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) адзін з гал. арганізатараў асветы і навукі на землях, далучаных да Рас. імперыі, адзін з заснавальнікаў Т-ва аматараў навук у Варшаве (1800). З 1805 візітатар школ Валынскай, Падольскай і Кіеўскай губ., заснаваў Крамянецкі ліцэй (з Г.*Калантаем*), ганаровы чл. Віленскага ун-та. У 1807 і 1808 арыштаваны па падазрэннях у антыўрадавай дзейнасці. Як гісторык належаў да «школы Нарушэвіча», у гіст. навуцы эпохі Асветніцтва прадстаўляў манархічную плынь. Першы пачаў даследаваць Статут ВКЛ 1529 (адкрыў і вывучаў яго Пулаўскі спіс). Гал. крыніцу Статутаў ВКЛ бачыў у звычаях паўн. народаў і германцаў, крытыкаваў погляды, быццам права ВКЛ грунтуецца на рымскім праве. Аўтар шматлікіх твораў па эканоміцы, гісторыі і праве, у т.л. «Аб дзесяцінах у свеце, а падрабязней у Польшчы і Літве» (1801), «Аб яўрэях», «Аб камісіі адукацыі ў Літве» (абодва 1807), «Аб манетнай справе ў Польшчы і Літве» (нап. 1810). Ініцыятар збірання нар. песень і паданняў, у якіх бачыў крыніцу для вывучэння дахрысціянскай Польшчы і Літвы. *В.С.Пазднякоў.*

ЧАЧАЛЁЎСКАЕ ВО́ЗЕРА. У Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дзісна, каля в. Чачалі, за 3,5 км на ПдУ ад г. Глыбокае. Пл. 0,53 км^2, даўж. 1,14 км, найб. шыр. 610 м, найб. глыб. 3,3 м, даўж. берагавой лініі 3,3 км. Пл. вадазбору 64,5 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу, круглаватая, выцягнутая з ПнЗ на ПдУ. Схілы катлавіны спадзістыя, разараныя; на Пн і ПнУ выш. 5—8 м, стромкія, пясчаныя, пад лесам. Берагі нізкія, пясчаныя, укрытыя хмызняком, месцамі забалочаныя. Дно выслана гліністым ілам і сапрапелем. Зарастае да глыб. 2,3 м. Шыр. паласы расліннасці 100—125 м. Праз возера цячэ р. Аржаніца, на Пн упадае ручай з воз. Белае.

ЧАЧО́РА, рака ў Кармянскім, Буда-Кашалёўскім і Чачэрскім р-нах Гомельскай вобл., правы прыток р. Сож (бас. р. Дняпро). Даўж. 56 км. Пл. вадазбору 551 км^2. Пачынаецца за 2 км на ПнУ ад в. Лёсавая Буда Кармянскага р-на, вусце на ўсх. ускраіне г. Чачэрск. Цячэ па Прыдняпроўскай нізіне. Даліна ў верхнім цячэнні невыразная, шыр. 500—600 м. Схілы пераважна адкрытыя, умерана стромкія і спадзістыя, выш. 7—10 м, месцамі да 15 м. Пойма двухбаковая (шыр. 200—500 м), асушаная, лугавая, асобныя ўчасткі пад хмызняком. Рэчышча каналізаванае, шыр. 3—6 м у верхнім цячэнні, 7—10 м у сярэднім і да 15 м у ніжнім. На рацэ вадасх. *Меркулавічы*. Асн. прытокі: Дулепа, Любіца (справа) і Глыбокая (злева). Разводдзе з 2-й дэкады сак. да пачатку 3-й дэкады красавіка. Прымае сцёк з сеткі меліярац. каналаў.

ЧАЧО́РА, вадасховішча ў Буда-Кашалёўскім р-не Гомельскай вобл., каля в. Выдрыца. Створана ў 1977 плацінай у даліне каналізаванага ўчастка р. Дулепа. Пл. 0,77 км^2, даўж. 3 км, найб. шыр. 260 м, найб. глыб. 3 м, аб'ём вады 1,17 млн. м^3. Сярэдні шматгадовы сцёк 7 млн. м^3. Чаша вадасховішча — частка поймы Дулепы. Дно выслана торфам і пяском. Ваганні ўзроўню вады на працягу года 1,5 м. Выкарыстоўваецца для арашэння зямель і рэкрэацыі.

ЧАЧО́РСКАЯ РАЎНІ́НА, Чачэрская раўніна, фізіка-геаграфічны раён *Перадпалескай правінцыі*, на ПдУ Беларусі. Займае паўд.-ўсх. частку Магілёўскай, паўн.-ўсх. і ўсх. часткі Гомельскай абласцей, заходзіць на тэр. Расіі. Мяжуе з Цэнтральнабярэзінскай і Аршанска-Магілёўскай раўнінамі, Гомельскім Палессем. Працягласць з Пн на Пд 80—130 км, з З на У 30—60 км, пл. 8,3 тыс. км^2. Выш 140—190 м над узр. мора.

У тэктанічных адносінах паўд. і цэнтр. часткі Ч.р. прымеркаваны да *Жлобінскай седлавіны*, крайняя Пн — да паўд. схілаў *Аршанскай упадзіны*. Крышт. фундамент перакрыты асадкавымі пародамі верхняга дакембрыю, дэвону, юры, мелу (мел, мергель), палеагену (пяскі, алеўрыты, гліны) і антрапагену. Антрапагенавая тоўшча (20—100 м) уключае адклады марэнныя (чырвона-бурыя валунныя супескі, суглінкі з праслоямі пяску, пясчана-жвіровай сумесі) дняпроўскага і сожскага зледзяненняў, водна-ледавіковыя, алювіяльныя, балотныя і інш.

Паверхня хвалістая, месцамі ўзгорыста-хвалістая. Адносныя вышыні 5—7 м, радзей да 15 м. Пераважаюць другасна-марэнныя раўніны, месцамі перакрытыя маламагутным чахлом з лёсападобных суглінкаў, на Пн — з водна-ледавіковых супескаў. Каля гарадоў Чачэрск і Слаўгарад дэнудацыйныя краявыя марэнныя грады (выш. 20—30 м), да якіх прымеркаваны лагчыны сцёку расталых ледавіковых вод. На міжрэччах трапляюцца суфазійныя западзіны, месцамі эолавыя формы рэльефу; на У ад Слаўгарада — карставыя западзіны. У даліне р. Сож вылучаюцца пойма (плоская, часам забалочаная, шыр. 2,5—3 км) і 2 надпоймавыя тэрасы (выш. 6 м і 14—15 м). Карысныя выкапні: легкаплаўкія гліны, пясчана-жвіровы матэрыял, мел, сапрапелі, торф. Сярэдняя т-ра студз. -7,4 °С, ліп. 18,4 °С. Ападкаў 637 мм за год. Рака Сож пераразае раўніну з Пн на Пд, мае прытокі Проня, Касалянка, Добрыч, Горна, Чачора, Ліпа, Галуба, Кляпінка, Покаць, Беседзь; у зах. ч. раўніны — прытокі р. Дняпро — Паўна, Ухлясць, Бабароўка, Гутлянка, Ракатун. На Пд раўніны пашыраны глебы дзярнова-палева-падзолістыя, на астатняй ч. — дзярнова-падзолістыя ў рознай ступені ападзоленыя; у катлавінах — дзярнова-глеевыя і дзярнова-карбанатна-глеевыя; у далінах рэк — поймавыя (алювіяльныя), дзярновыя забалочаныя, радзей тарфяна-балотныя. Лясістасць да 30%. Масівы хваёвых кусцікава-зеленамошных і лішайнікава-кусцікавых лясоў чаргуюцца з бярэзнікамі арляковымі і чорнаалешнікамі вятроўнікавымі. На правабярэжжы р. Сож пераважаюць хвойнікі імшыстыя і лішайнікавыя. Участкамі дубровы, шыракаліста-яловыя і шыракаліста-хваёвыя лясы. Пад ворывам каля 50% тэрыторыі. У межах Ч.р. біял. заказнік рэсп. значэння *Чачэрскі*.

ЧАЧО́Т Ян Антоні (7.7.1796, в. Малюшычы Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл. — 23.8.1847), бел. і польскі паэт,



Я.Чачот.

фальклярыст, этнограф. Скончыў Навагрудскую дамініканскую школу (1815), дзе пасябраваў з А.*Міцкевічам*. Вучыўся ў Віленскім ун-це (1815—16). Працаваў у бюро па ўпарадкаванні архіваў кн. Радзівілаў (Вільня). З 1818 чл. т-ва *філаматаў*, пісаў песні і вершы на бел. і польскай мовах для студэнцкіх сходаў. З 1820 узначальваў літ. (блакітны) аддзел т-ва *філарэтаў*. У 1823 за прыналежнасць да студэнцкіх згуртаванняў зняволены ў Віленскую турму, дзе склаў рукапісны зб. «Песенькі і іншыя вершы». У 1824 сасланы на Урал (турэмнае зняволенне адбываў у крэпасці Кізіл), у 1825 пераведзены ва Уфу, у 1831 — у Цвер. У 1833 вярнуўся на радзіму, працаваў на Лепельшчыне і ў б-цы Храптовічаў на Навагрудчыне. Пісаць пачаў у філамацкі перыяд. У 1818—19 напісаў каля 10 балад (збераглося 8), засн. на бел. фальклоры («Свіцязь», «Бекеш», «Узногі», «Мышанка», «Калдычэўскі шчупак», «Наваградскі замак», «Падземны звон на горцы ў Пазяневічах», «Радзівіл, альбо Заснаванне Вільні»). Адстойваў інтарэсы самага бяспраўнага класа тагачаснага бел. грамадства — сялянства, выказваўся за адмену прыгоннага права («Узногі»). Збіраў і вывучаў бел. фальклор. Выдаў 6 фальклор. зб-каў «Сялянскія песні» (1837—46), куды ўвай-

шлі 1000 песень у перакладзе на польскую мову і ў арыгінале, прыказкі і прымаўкі, слоўнік бел. мовы (200 слоў) і ўласныя вершы. Аўтар кніг «Аповесці для маладых дзяўчат» (1845), «Некаторыя заўвагі, якія асабліва датычацца стылю трэцяй песні «Анафеляс» з «Вітаўтавых баёў» П.Крашэўскага» (1846), лібрэта аперэты «Малгажата з Зембаціна». Выяўлены вял. цыкл яго песень-балад на польскай мове «Спевы пра даўніх ліцвінаў да 1434 г.» (нап. ў 1842—44, апубл. ў перакладзе на бел. мову 1996). Многія яго вершы пакладзены на музыку Т.Занам. На бел. мову творы Ч. пераклаў К.Цвірка.

Тв.: Бел. пер. — Наваградскі замак: Творы. Мн., 1989; Выбр. творы. Мн., 1996; Свіцязь. Мн., 1999.

Літ.: Мальдзіс А. Ян Чачот // Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX ст. Мн., 1969; Перкін Н. Літаратурная спадчына Яна Баршчэўскага і Яна Чачота // Перкін Н. Абсягі думкі. Мн., 1980; Малаш Л. Ян Чачот // Каханоўскі Г., Малаш Л., Цвірка К. Беларуская фальклярыстыка: Эпоха феадалізму. Мн., 1989; Цвірка К. Лісце забытых алеяў. Мн., 1993. *К.А.Цвірка.*

«ЧАЧО́ТАЧКА», бел. сцэнічны танец. Муз. памер 2/4. Тэмп умераны. Створаны ў 1970 балетмайстрам В.Партным на аснове элементаў бел. танц. фальклору. Выконваецца 16 парамі юнакоў і дзяўчат пад музыку аднайм. бел. нар. песні ў апрацоўцы М.Талстога і В.Ігнацьева. Вылучаецца разнастайнасцю прасторавых харэаграфічных малюнкаў.

С.М.Грабеншчыкоў.

ЧАЧО́ТКА, карэльская бяроза (Betula pendula var. carelica), кветкавая расліна сям. бярозавых, разнавіднасць *бярозы* павіслай. Пашырана ў паўн. і цэнтр. ч. Еўропы. На Беларусі, акрамя паўд.-ўсх. і паўд. раёнаў, расце ўсюды асобнымі дрэвамі, радзей курцінамі ў мяшаных лясах. Бярэзнікі з Ч. ў Боркаўскім і Калінінскім лясніцтвах Івацэвіцкага р-на — помнікі прыроды рэсп. значэння.

Лістападнае дрэва выш. да 25 м або куст. Крона шырокая, раскідзістая, з вілаватым галінаваннем. На ніжняй ч. ствала і галінах утвараюцца наплывы і нарасці розных памераў. Паверхня драўніны пад карой рэльефная, на папярочным зрэзе — характэрны зоркападобны малюнак. Лісце трохвугольна-яйцападобнае. Плод — арэх. Драўніна Ч. жоўтая, вельмі цвёрдая, з прыгожай мармурападобнай тэкстурай, ідзе на выраб мэблі, муз. інструментаў, маст. вырабаў, аддзелку інтэр'ераў.

ЧАЧО́ТКІ (Acanthis), род птушак сям. ўюрковых атр. вераб'інападобных. 6 відаў. Пашыраны ў Еўропе, Паўн. Амерыцы, Паўн. і Паўд.-Усх. Азіі, Афрыцы. На Беларусі трапляюцца *канаплянка*, у перыяд зімовага вандравання Ч. звычайная (A. flammea) і вельмі рэдкі залётны від Ч. горная (A. flavirostris).

Даўж. да 16 см, маса да 25 г. Ч. звычайная мае бура-шэрае з ружаватым на грудзях і брушку апярэнне, чырв. «шапачку» і надхвосце. Кормяцца пераважна насеннем і дробнымі насякомымі.

ЧАЧУ́ЛІН Дзмітрый Мікалаевіч (22.8.1901, г. Шостка Сумскай вобл., Украіна — 29.10.1981), расійскі архітэктар. Нар. архітэктар СССР (1971). Герой Сац. Працы (1976). Акад. Акадэміі архітэктуры СССР (1979). Скончыў Вышэйшы маст.-тэхн. ін-т у Маскве (1929). Вучань А.*Шчусева*. У 1945—49 гал. архітэктар Масквы. У архітэктуры станцый Маскоўскага метрапалітэна ў ордэрныя формы ўводзіў багаты дэкор з выкарыстаннем колеру: перонныя залы станцый «Камсамольская» (1935) і «Кіеўская» (1937; Дзярж. прэмія СССР 1941), наземны вестыбюль станцыі «Дынама» (1938). Формы класічнага ордэра спалучаў з буйнымі маштабамі, масіўнымі аб'ёмамі будынкаў: Канцэртная зала імя П.Чайкоўскага (1940, з К.Арловым), гасцініца «Пекін» (1946—50). Вылучаюцца жылы дом на Кацельніцкай набярэжнай (1948—52, з А.Расткоўскім; Дзярж. прэмія СССР 1953), комплекс гасцініцы «Расія» (1967—70) з Цэнтр. канцэртнай залай (1974), Дом урада Рас. Федэрацыі («Белы дом»; 1965—79, усе з арх. П.Штэлерам).

Літ.: Журавлев А.М. Д.Чечулин. М., 1985.

Чачоткі. Самцы: 1 — звычайная; 2 — тундраная, або попельная; 3 — горная.

Дз. **Чачулін**. Жылы дом на Кацельніцкай набярэжнай у Маскве.

Узоры дэкаратыўнай драўніны з **чачоткі**.

ЧА́ЧЫН Віктар Мікалаевіч (25.1.1930, г. Гомель — 6.6.1994), бел. вучоны ў га-

ліне тэхналогіі машынабудавання. Акад. АН Беларусі (1980; чл.-кар. 1974), д-р тэхн. н. (1974), праф. (1976). Засл. дз. нав. Беларусі (1983). Скончыў БПІ (1952). З 1958 у Фізіка-тэхн. ін-це АН Беларусі (з 1970 дырэктар). З 1983 рэктар БПА. Навук. працы па заканамернасцях пластычнага дэфармавання металаў, аптымальных тэхнал. рэжымах апрацоўкі матэрыялаў з выкарыстаннем

В.М.Чачын.

ударных хваль і інш. Даследаваў працэсы вібрацыйнага шліфавання і метады абразіўнай апрацоўкі ў актыўных асяроддзях. Дзярж. прэмія Беларусі 1980.

Тв.: Профилирование алмазных шлифовальных кругов. Мн., 1974 (разам з У.Дз.Дарафеевым); Электрогидравлическая обработка машиностроительных материалов. Мн., 1978; Электрогидроимпульсная обработка материалов в машиностроении. Мн., 1987 (у саўт.).

ЧАЧЭ́ВІЦКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1924—31. Утвораны 17.7.1924 у складзе Магілёўскай акругі. Цэнтр — в. Чачэвічы. 20.8.1924 падзяляўся на 10 сельсаветаў. 8.7.1931 раён скасаваны, сельсаветы перададзены Быхаўскаму і Клічаўскаму р-нам.

ЧАЧЭ́РСК, горад, цэнтр Чачэрскага р-на Гомельскай вобл., прыстань на р. Сож пры ўпадзенні ў яе р. Чачора; аўтадарогамі злучаны з г. Карма, Ветка; каля аўтадарогі Гомель—Магілёў. За 65 км ад Гомеля, 37 км ад чыг. ст. Буда-Кашалёўская на лініі Гомель—Жлобін. 7,7 тыс. ж. (2002). Прадпрыемствы харч. і мясц. прам-сці. *Чачэрскі гісторыка-этнаграфічны музей*. Брацкія магілы сав. воінаў і партызан, ахвяр фашызму. Помнікі архітэктуры: *Чачэрская Спаса-Праабражэнская царква, Чачэрская ратуша*. Помнік археалогіі — гарадзішча Замкавая Гара.

Стараж. гарадзішча Замкавая Гара размешчана на паўн.-ўсх. ускраіне горада, на мысе правага берага р. Чачора. Складаецца з дзядзінца авальнай формы (пл. каля 1 га) і вакольнага горада (пл. больш за 2 га). Выяўленыя пры раскопках рэчы эпохі Кіеўскай Русі сведчаць пра ўзнікненне стараж. горада ў 10 ст. Вакольны горад існаваў у 11 ст. Упершыню ўпамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1159 як горад радзімічаў Чичерск, які кіеўскі кн. Ізяслаў Давыдавіч вярнуў чарнігаўскаму кн. Святаславу Ольгавічу. У 12—13 ст. уваходзіў у *Чарнігаўскае княства*. З сярэдзіны 14 ст. ў ВКЛ, цэнтр воласці, з 1509 мястэчка Віленскага ваяв. З 1501 належаў Алене Іванаўне, жонцы вял. кн. Аляксандра, з 1621 — Сапегам. У 14 ст. на месцы дзядзінца летапіснага горада пабудаваны *Чачэрскі замак*. З 1510 цэнтр Чачэрскага староства, меў правы гар. самакіравання. З 1566 у Рэчыцкім пав. Мінскага ваяв. З 1629 меў прывілей на штотыднёвы гандаль і на 2 двухтыднёвыя кірмашы на год. У *антыфеадальную вайну 1648—51* у наваколлі Ч. адбыліся сял. паўстанні. У 1654 горад займалі казацкія войскі І.Н.Залатарэнкі. Да 1659 тэр. Ч. ў складзе гетманскіх казацкіх уладанняў на Беларусі. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) Ч. у складзе Рас. імперыі, цэнтр павета ў Рагачоўскай правінцыі Магілёўскай губ., потым мястэчка, у 1778—96 цэнтр воласці Рагачоўскага пав. Магілёўскага намесніцтва, у 1796—1802 у Беларускай, з 1802 зноў у Магілёўскай губ. У 1774 Ч. падараваны Кацярынай II бел. ген.-губернатару графу З.Р.Чарнышову, які стварыў тут прыгонныя тэатр і аркестр. У 2-й пал. 18 ст. пабудаваны *Чачэрская ратуша*, вакол якой размяшчаліся 4 храмы-ратонды, *Чачэрская Спаса-Праабражэнская царква*, працавалі прыстань «Крэмень», 2 бальніцы, створаны *Чачэрскі парк*. У 1780—1879 дзейнічаў *Чачэрскі шклозавод*, у сярэдзіне 19 ст. — шкіпінарны і паташны з-ды. У 1880 у Ч. 1667 ж., 266 дамоў, 76 крам, 2 нар. вучылішчы, 4 кірмашы на год. У 1902 адкрыта 3-класнае гар. вучылішча. У 1903 у Ч. 2468 ж. У 1903—07 дзейнічала Чачэрская арг-цыя РСДРП. З 1919 у Гомельскай губ. РСФСР. З 1926 у складзе БССР, цэнтр *Чачэрскага раёна*. З 27.9.1938 гар. пасёлак. У 1939 — 5,1 тыс. ж. У Вял. Айч. вайну з 16.8.1941 акупіраваны ням. фашыстамі, якія загубілі ў Ч. і раёне 1137 чал., у т.л. ў Ч. каля 500 чал. Вызвалены 27.11.1943 войскамі 61-й арміі Бел. фронту ў ходзе *Гомельска-Рэчыцкай аперацыі 1943*. У 1959 у Ч. 2,7 тыс. ж. З 25.12.1962 да 6.1.1965 у Буда-Кашалёўскім р-не. У 1970 — 5,8 тыс. ж. З 3.11.1971 горад.

В.В.Грынявецкі (гісторыя).

ЧАЧЭ́РСКАЯ РА́ТУША, помнік архітэктуры класіцызму з элементамі псеўдаготыкі ў г. *Чачэрск* Гомельскай вобл. Пабудавана ў 2-й пал. 18 ст. ў цэнтры горада. Мураваны 2-павярховы квадратны ў плане цэнтрычны будынак, завершаны 5 драўлянымі чацверыковымі вежамі; 4 з іх размешчаны па вуглах асн. аб'ёму і ўвянчаны шпілямі, 5-я (больш высокая і звужаная ўверсе) — пасярэдзіне на масіўным чацверыковым барабане. Аконныя праёмы прамавугольныя, стральчатыя і з паўцыркульнымі арачнымі завяршэннямі. Карніз з фігурнымі краштэйнамі. Да 2 уваходаў па баках гал. фасада вядуць манум. каменныя лесвіцы. Будынак рэстаўрыруецца (2003).

У.А.Чантурыя.

Чачэрская ратуша.

ЧАЧЭ́РСКАЯ СПА́СА-ПРААБРАЖЭ́НСКАЯ ЦАРКВА́, помнік архітэктуры класіцызму ў г. *Чачэрск* Гомельскай вобл. Пабудавана ў 1783 графам З.Р.Чарнышовым у ансамблі з 3 інш. храмамі (не захаваліся). Мураваны 2-ярусны храмратонда (у плане круг з унутр. дыяметрам каля 15 м), завершаны паўсферычным купалам на ступеньчатым барабане. Над бабінцам (прамавугольны ў плане аб'ём з франтонам на гал. фасадзе) пабудавана васьмерыковая вежаваніца, накрытая гранёным купалком, з У да царквы прылягае прамавугольная алтарная апсіда. Асн. аб'ём падзелены на ярусы развітым дарычным антаблементам. Сцены ніжняга яруса рытмічна расчлянёны пілястрамі, паўкруглымі і плоскімі нішамі, верхняга яруса — квадратнымі аконнымі праёмамі, паміж якімі фігурныя філянговыя рамы. У інтэр'еры пілястры ўпрыгожаны стылізаванымі іанічнымі капітэлямі; былі размалёўкі італьян. майстроў.

Чачэрская Спаса-Праабражэнская царква.

У.А.Чантурыя.

ЧАЧЭ́РСКІ, біялагічны заказнік рэсп. значэння ў Чачэрскім р-не Гомельскай вобл. Засн. ў 1978 для аховы, рацыянальнага выкарыстання і аднаўлення прыродных запасаў лек. раслін. Пл. 24,6 тыс. га. Водна-ледавіковая раўніна з дзюнамі, на З — хвалістая тэраса з астанцамі марэннай раўніны і дзюнамі. Глебы дзярнова-падзолістыя забалочаныя і пясчаныя. Пераважаюць хвойнікі (60%) і бярэзнікі (19%) імшыстыя, верасовыя, арляковыя, чарнічныя; пашыраны ельнікі, трапляюцца чорнаалешнікі, дубровы, асіннікі, грабнякі. Лек. расліны: цмен пясчаны, святаяннік прадзіраўлены, чарніцы, брусніцы, ландыш майскі, крапіва двухдомная, палын лячэбны, сардэчнік сардэчны, страўснік звычайны, зуброўка паўднёвая і інш. У Чырв. кнізе — пылкагалоўнік чырвоны, жаўтазель германскі, канюшына лубіна-

вая; з жывёл — барсук, кулік-сарока, чорны бусел. *П.І.Лабанок.*

ЧАЧЭ́РСКІ ГІСТО́РЫКА-ЭТНАГРАФІ́ЧНЫ МУЗЕ́Й. Засн. 1.7.1990 у г. *Чачэрск*. Больш за 16,5 тыс. экспанатаў. Асн. фонду (2002). Сярод экспанатаў фрагменты касцей маманта, ляпныя гаршкі часоў неаліту, крамянёвыя прылады працы, жаночыя ўпрыгожанні, нацельны абразок 12 ст. з археал. помнікаў *Бердыж, Нісімкавічы* і Чачэрскага гарадзішча, матэрыялы пра *Чачэрскі замак*, рэв. падзеі 1905—07, дзейнасць падполля і партыз. рух на тэр. раёна ў Вял. Айч. вайну, землякоў Герояў Сав. Саюза М.С.Байкова, М.К.Круглікава, А.І. і П.І. Лізюковых, Ц.П.Новікава, удзельнікаў вайны ў Афганістане 1979—89. Экспануюцца прылады працы і прадметы побыту сялян 19 — пач. 20 ст., калекцыі нар. касцюмаў, ручнікоў, стараж. абразоў мясц. майстроў і іканапісцаў Г. і У. Гераковых. *А.Ю.Свежынцаў.*

ЧАЧЭ́РСКІ ЗА́МАК. Існаваў у 14—18 ст. у г. *Чачэрск* Гомельскай вобл. Пабудаваны на дзядзінцы летапіснага горада 10—13 ст. Займаў мыс карэннага берага р. Чачора (прыток Сажа). У пач. вайны Маск. дзяржавы з ВКЛ 1534—37 у замку стаяла 150 коннікаў і 100 салдат-драбаў. У вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 горад і замак неаднаразова асаджалі рус. войскі, у выніку чаго замкавыя ўмацаванні моцна пацярпелі і былі адноўлены толькі пасля вайны. Гіст. крыніцы за 1682 паведамляюць пра наяўнасць на замкавай гары 8 вежаў, у т.л. вежы-брамы і хваёвага двайнога астрога. Гэтыя пабудовы абкружаў абарончы роў. Паводле попісу Чачэрска за 1765, існаваў замак з яго брамай Замкавай. Да нашага часу валы Ч.з. не захаваліся. Збярогся толькі замкавы роў, які з ПдУ дугой агінае замчышча. Там, дзе раней быў мост, цяпер насыпана дамба, што злучае замчышча з горадам.

ЧАЧЭ́РСКІ ПАРК. Існаваў у 2-й пал. 18 — 1-й пал. 20 ст. ў г. *Чачэрск* Гомельскай вобл. Створаны на паўн.-зах. ускраіне горада. Парк (пл. 12 га) пейзажнага тыпу з элементамі рамантызму. Паніжаўся да грэбеня адхону і стромка спускаўся да поймы р. Чачора. На беразе ракі, на месцы земляных умацаванняў старога замка, быў пабудаваны вял. палац у стылі несапраўднай готыкі. У кампазіцыю парку ўключаліся рэшткі старых умацаванняў, мураваны касцёл, сажалкі. Парк знішчаны ў Вял. Айч. вайну. Захаваліся асобныя фрагменты. *В.Р.Анціпаў.*

ЧАЧЭ́РСКІ РАЁН. Размешчаны на ПнУ Гомельскай вобл. Утвораны 8.12.1926, скасаваны 25.12.1962, адноўлены 6.1.1965. Пл. 1,2 тыс. км². Нас. 17,5 тыс. чал. (2003), гарадскога 44%. Сярэдняя шчыльн. 15 чал. на 1 км². Цэнтр — г. *Чачэрск*. Уключае 124 сельскія нас. пункты, 7 сельсаветаў: Залескі, Ленінскі, Меркулавіцкі, Нісімкавіцкі, Палескі, Роўкавіцкі, Чачэрскі. Раён значна пацярпеў ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Тэр. пераважна забруджана радыенуклідамі 5—15 Ku/км², невял. ўчасткі на У і Пд маюць забруджанасць больш за 40 Ku/км². У выніку міграцыі ў 1985—92 насельніцтва зменшылася на 9,9 тыс. чал.

Тэр. раёна ў межах *Чачорскай раўніны*. Паверхня раўнінная, месцамі дробнаўзгорыстая, 73% яе на выш. 140—160 м, 25% — ніжэй за 140 м. Найвыш. пункт 177 м (г. Лысая каля паўд. ускраіны Чачэрска). Агульны нахіл паверхні з Пн на Пд. Карысныя выкапні: торф, мел і мергель, пяскі, гліны і суглінкі. Сярэдняя т-ра студз. -7,4 °С, ліп. 18,4 °С. Ападкаў 637 мм за год. Вегетац. перыяд 191 сут. Найб. р. Сож з прытокамі Покаць, Чачора, Ліпа; на ПнУ — р. Каўпіта (прыток Беседзі). Азёры: Коўпіна, Старое, Стаячае, Святое; шмат азёр-старыц, у т.л. Вілія, Вір, Асіннае, Старасожка. Вадасховішча Меркулавічы на р. Чачора. Меліярац. каналы: Навухава-Мальніцкі, Рэзкі-Пола, Сычаўка і інш. Глебы с.-г. угоддзяў: дзярнова-падзолістыя (45,9%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (32%), тарфяна-балотныя і поймавыя (13,9%) і інш. Пад лесам 46% тэр., пераважна на У і левабярэжжы р. Сож. Пераважаюць хваёвыя, бярозавыя, чорна-альховыя лясы; трапляюцца дубовыя, асінавыя, грабавыя і інш. Штучныя насаджэнні складаюць 27,8% лясоў. Пад балотамі 3% тэр. У межах раёна біял. заказнік рэсп. значэння *Чачэрскі*.

Агульная пл. с.-г. угоддзяў 44,5 тыс. га, з іх асушаных 8,2 тыс. га. На 1.1.2003 у раёне 7 калгасаў, 5 саўгасаў, 1 фермерская гаспадарка. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, вырошчванні збожжавых і кармавых культур, бульбаводстве. Прадпрыемствы прам-сці: харч. (хлебабулачныя вырабы, пладова-ягаднае віно), спецлясгас (буд. матэрыялы, тавары нар. ўжытку з драўніны); вытв-сць маст. вырабаў з саломы і лазы. На З раёна праходзіць аўтастрада С.-Пецярбург—Адэса; з Чачэрска аўтадарогі ідуць на Магілёў, Гомель, Буда-Кашалёва, Карму, Краснаполле, Ветку і інш. У раёне 5 сярэдніх, 4 базавыя школы, 5 комплексаў школа-сад, спарт. школа, дзіцячы дом сямейнага тыпу, раённы цэнтр дзіцячай творчасці, сац. прытулак, 11 дашкольных устаноў, у т.л. 6 груп у комплексе школа-сад, 10 дамоў культуры, 9 клубаў, 18 б-к, 2 бальніцы, 1 паліклініка, 4 амбулаторыі, 8 фельч.-ак. пунктаў. Раённы гісторыка-этнагр. музей. Выдаецца газ. «Чачэрскі веснік».

Літ.: Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Гомельская вобл. Мн., 1985; Памяць: Гіст.-дак. хроніка Чачэрскага р-на. Мн., 2000. *Г.В.Малалетнікава, Г.С.Смалякоў.*

ЧАЧЭ́РСКІ ШКЛОЗАВО́Д. Дзейнічаў у 1780—1879 ва ўрочышчы Асінаўка Рагачоўскага пав. (цяпер у межах г. Чачэрск Гомельскай вобл.). Вырабляў бутэлькі, слоікі, багемскае, белае лісставое і аконнае шкло. Меў 2 печы для варкі шкла, 2 печы для абпалу гаршкоў, паравы рухавік. Сыравіна прывазная: гліна з Наўгародскай губ., попел саламяны з Чарнігаўскай губ., сода з Рыгі, глаўберава соль з Прусіі. У 1862 працавала 195 рабочых. На прамысл. выстаўцы (Масква, 1859) і Усерас. (Масква, 1860) чачэрскае шкло прызнана лепшым і адзначана за добрую якасць.

ЧА́ША (лац. Crater), сузор'е Паўд. паўшар'я *зорнага неба*. Найб. яркая зорка 3,6 візуальнай *зорнай велічыні*. На Беларусі відаць зімой і вясной.

ЧА́ШАЧКА, вонкавая частка падвоенага *калякветніка*, звычайна зялёная. Бывае раздзельналістая (калі чашалісцікі, што яе ўтвараюць, свабодныя) і зрослалістая (у ёй адрозніваюць трубку і зубцы). Асн. функцыя — ахова інш. ч. кветкі, таму Ч. вельмі рана развіваецца. Мае лісцевае паходжанне. У некат. раслін (напр., верас, гартэнзія) Ч. буйная, яркаафарбаваная для прывабліванне насякомых, замест вяночка.

ЧА́ШАЧКА, род малюскаў; гл. *Анцылус*.

ЧА́ШНІК, пасада (урад) у Польшчы ў 13—18 ст. і ў ВКЛ у 15—18 ст. Загадваў віннымі скляпамі князя або караля, у час застолля падносіў яму чашу з віном. У Польшчы з 14 ст. ганаровы тытул. У ВКЛ Ч. вял. князя вядомы з 1409. Пры двары вял. кн. Аляксандра [1492—1506] было некалькі Ч. З цягам часу пасада ператварылася ў намінальную. У паветах існавалі павятовыя Ч. З 17 ст. ўсталявалася польская форма назвы пасады — чэснік.

ЧА́ШНІКІ, горад, цэнтр Чашніцкага р-на Віцебскай вобл., на р. Ула. Аўтадарогі на Лепель, Новалукомль, Сянно. За 95 км ад Віцебска, 3 км ад чыг. ст. Чашнікі на лініі Орша—Лепель. 10 тыс. ж. (2002). Прадпрыемствы цэлюлозна-папяровай (*Чашніцкая папяровая фабрыка*), пач. апрацоўкі лёну, харч., лесанарыхтоўчай прам-сці. *Чашніцкі гістарычны музей*. Брацкія магілы сав. воінаў і партызан. Помнік архітэктуры — Спаса-Праабражэнская царква (1843—45).

У 16 ст. Ч. ўваходзілі ў Полацкае ваяв. ВКЛ, належалі кн. Лукомскім, з канца 16 ст. Кішкам, Сапегам, Патоцкім, Валадковічам. У

Дом культуры ў г. **Чашнікі**.

Лівонскую вайну 1558—83 каля Ч. войскі ВКЛ разгромілі ў *Ульскай бітве 1564* і ў 1567 маскоўскае войска; паводле загаду Івана IV Грознага на правым беразе Улы пабудаваны ўмацаваны замак (у 1708 спалены). У 17 ст. Ч. — гандл. мястэчка, у 1633 тут 109 дамоў і 16 крам. Каля 1674 харунжы А.Служка заснаваў *Чашніцкі кляштар дамініканцаў*, на месцы якога ў 1786 пабудаваны мураваны касцёл у стылі позняга барока. У 18 ст. ў Ч. існавалі прыстань, больш за 40 складоў, майстэрні па вырабе гандл. суднаў — стругаў. У 2-й пал. 18 ст. Ч. мелі гандл. прывілеі, у 1791—93 лічыліся цэнтрам Полацкага ваяв. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) Ч. ў складзе Рас. імперыі, мястэчка Лепельскага пав. Полацкай, з 1796 Беларускай, з 1802 Віцебскай губ. У вайну 1812 каля Ч. 31.10.1812 адбылася бітва рас. войск з корпусам маршала Удзіно (гл. *Чашніцкія баі 1812*). У 1843—45 пабудавана Спаса-Праабражэнская царква. У час паўстання 1863—64 у касцёле размяшчаўся апорны пункт супраціўлення ўрадавым войскам, пасля чаго касцёл быў ператвораны ў Мікалаеўскую царкву. У 1886 засн. папяровая ф-ка. У 1897 у Ч. 4590 ж., 703 будынкі, лячэбніца, аптэка, 2 нар. вучылішчы. У 1909 адкрыта гар. вучылішча, якое ў 1913 пераўтворана ў вышэйшае пачатковае. У 1919—24 у складзе РСФСР. З 17.7.1924 цэнтр *Чашніцкага раёна* ў Віцебскай, потым Лепельскай акр., з 1938 у Віцебскай вобл. З 27.9.1938 гар. пасёлак. У 1939 — 3,5 тыс. ж. У Вял. Айч. вайну з 5.7.1941 акупіраваны ням. фашыстамі, якія загубілі ў Ч. і раёне 3610 чал. У раёне дзейнічала *Чашніцкае патрыятычнае падполле*. У час *Лепельскай аперацыі 1943* байцы Смаленскага партыз. палка вялі жорсткія баі супраць гарнізона гітлераўцаў (гл. *Чашніцкія баі 1943*). Вызвалены 27.6.1944 войскамі 1-га Прыбалт. фронту ва ўзаемадзеянні з партызанамі Чашніцкай брыгады «Дубава» ў ходзе *Віцебска-Аршанскай аперацыі 1944*. У 1962—65 у Бешанковіцкім р-не. З 7.2.1966 горад. У 1970 — 6,6 тыс. жыхароў.

В.В.Ірынявецкі (гісторыя).

ЧА́ШНІЦКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала са жн. 1941 да крас. 1942 у Чашніцкім р-не. Кіруючы орган («цэнтр»): С.Е.Папкоў (кіраўнік), У.Т.Гаваркоўскі, Д.А.Кіркіж, М.П.Корбан, Р.Е.Корбан, П.Д.Лазарэвіч, М.С.Марціновіч. Займалася разгортваннем партыз. руху на тэр. Чашніцкага р-на. Падпольшчыкі вялі паліт. работу сярод насельніцтва, распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро. У жн. 1941 створаны і ўзброены 2 баявыя групы — В.А.Захарчанкі і А.Л.Сухушына; 1-я з іх вырасла ў партыз. атрад Захарчанкі, які ўваходзіў у Сенненскую брыгаду, 2-я ўлілася ў атрад «Сібірак» (пазней у складзе брыгады «За Савецкую Беларусь»). У барацьбе з акупантамі загінулі 11 падпольшчыкаў. У гонар падпольшчыкаў і партызан у в. Грынькі ў 1975 установлена мемар. дошка. *А.Ф.Маркава*.

ЧА́ШНІЦКАЯ ПАПЯРО́ВАЯ ФА́БРЫКА «Чырвоная Зорка». Засн. ў 1886 у в. Смальянцы Лепельскага пав. (цяпер у межах г. *Чашнікі*) як папяровая ф-ка «Скіна». Выпускала кардон, паперу для пісьма, каляровую, друкарскую, абгортачную, муштучную (для папярос). Мела з 1890 паравую машыну, з 1895 вадзяную турбіну і лакамабіль, у 1908 4 паравадзяныя рухавікі, у 1894—1912 устаноўлены 3 папераробныя машыны; працавала да 397 рабочых. З 1923 сучасная назва. У Вял. Айч. вайну разбурана. У 1945 пушчана 3-я, у 1948 — 2-я, у 1950 — 1-я, у 1974 — 4-я, у 1980 — 5-я папераробныя машыны. У 1990-я г. 2 старыя (1905, 1908) папераробныя машыны дэманціраваны. У 1993 пабудаваны цэх па вытв-сці водарастваральных фарбаў для друку флексаграфічным і глыбокім спосабамі (з 1997 закансерваваны). У 1997 уведзена вытв-сць гафрыраванага кардону і тары з яго. Асн. прадукцыя (2003): папера для гафрыравання, кардон для плоскіх слаёў, гафракардон і тара з яго. *С.В.Падрэз*.

ЧА́ШНІЦКАЯ РАЎНІ́НА, фізіка-геаграфічны раён Бел.-Валдайскай правінцыі на ПдУ Віцебскай вобл. Мяжуе з Полацкай нізінай на Пн, Віцебскім узвышшам на ПнУ, Лучоскай нізінай на У, Аршанскім узвышшам на Пд, Верхнебярэзінскай нізінай на ПдЗ і З. Працягнулася з З на У на 40—72 км, з Пн на Пд на 30—70 км. Пл. каля 2,5 тыс. км^2. Найб. выш. 192 м на Пд.

Ч.р. прымеркавана да ўсх. схілу Вілейскага пахаванага выступу *Беларускай антэклізы*. Крышт. фундамент перакрыты асадкавай тоўшчай з пратэразойскіх (рыфей, венд), дэвонскіх, антрапагенавых адкладаў. Антрапагенавая тоўшча (магутнасць 120 м, у ледавіковых лагчынах да 300 м) складзена з ледавіковых (чырв.-бурыя суглінкі), патокава-ледавіковых (пяскі і пясчана-жвіровыя сумесі) і азёрна-ледавіковых (пясчана-гліністыя тоўшчы) адкладаў паазерскага, сожскага і інш. зледзянення, а таксама адкладаў муравінскага, шклоўскага і больш стараж. міжледавіковых і сучасных алювіяльных, азёрных, балотных і інш.

Паверхня раўніны ў паўн. ч. хваліста, амаль плоская, парэзана лагчынамі сцёку, катлавінамі. Абс. выш. 140—160 м, ваганні адносных выш. 1—5 м. Зрэдку трапляюцца озы выш. 5—7 м. На Пд і ПдУ раўніна ўзгорыстая, парэзаная шматлікімі лагчынамі, азёрнымі катлавінамі, вакол якіх озы і камы. Ваганні адносных вышынь да 30 м. Карысныя выкапні: гліны легкаплаўкія, пясчана-жвіровы матэрыял, торф, сапрапель. Асн. рэкі: Ула з прытокамі Усвейка, Свячанка, Лукомка; Крывінка з Бярозкай; Абалянка. Шмат азёр, найб. Жэрынскае, Саро, Сянно, Бярозаўскае. Сярэднія т-ры студз. -7,5 °С, ліп. 17,8 °С. Ападкаў 592 мм за год. Пераважаюць дзярнова-падзолістыя і дзярнова-падзолістыя забалочаныя сугліністыя глебы, якія на Пд раўніны больш апясчаненыя і завалуненыя. У паніжэннях тарфяна-балотныя глебы, у далінах рэк — поймавыя. Лясістасць да 30%. У западзінах на вярховых тарфяніках — хвойнікі, у паніжэннях, уздоўж рэк і ручаёў — вольха чорная і бяроза пушыстая. Значныя плошчы заняты ельнікамі са шматлікімі бярэзнікамі, асіннікамі, шэраалешнікамі. Балоты вярховыя, пераходныя, зрэдку нізінныя. Сухадольныя і нізінныя лугі. Пад ворывам 30% тэрыторыі.

ЧА́ШНІЦКІ ГІСТАРЫ́ЧНЫ МУЗЕ́Й. Засн. 15.8.1987, адкрыты 30.3.1991 у г. *Чашнікі* Віцебскай вобл. Пл. экспазіцыі 190 м^2, 5150 экспанатаў асн. фонду (2002). Сярод экспанатаў фрагменты гліняная посуду 9—11 ст. і шкляных бранзалетаў 11—12 ст. з археал. помнікаў Чашніцкага р-на, прадметы побыту сялян, рамеснікаў, купцоў пач. 20 ст., нар. адзенне 1930-х г., матэрыялы па стварэнне і дзейнасць падполля і партыз. рух у Вял. Айч. вайну, пра землякоў Герояў Сав. Саюза Л.У.*Буткевіча*, Я.П.*Іваноўскага*, Я.Г.*Навіцкага*, С.Ф.*Пшоннага*, М.А.*Сурына*, кавалера ордэна Славы П.Р.*Барадаўку*. Музей праводзіць выстаўкі карцін мастакоў, вырабаў саломапляцення, разьбы па дрэве, ткацтва, вышыванак.

ЧА́ШНІЦКІ КЛЯ́ШТАР ДАМІНІКА́НЦАЎ. Засн. каля 1674 у г. *Чашнікі* Віцебскай вобл. З.Слушкам. Будынак кляштара змураваны ў 1750. Касцёл Праабражэння пабудаваны ў 1779—86 прыёрам Гуціскім, асвячоны ў 1804 суфраганам полацкім Ц.Адынцом. Лічыўся адным з самых вял. і прыгожых касцёлаў на У Беларусі. На фасадных вежах размяшчаліся гадзіннік і 3 званы, адлітыя ў Рызе. У 1816 аздоблены насценнымі размалёўкамі, частка іх існавала яшчэ ў пач. 20 ст. У касцёле асабліва шанавалася скульптура Ісуса, выразаная селянінам Прыстаю ў пач. 18 ст. Алтарныя абразы намаляваны мастаком В.Лейндорфам. У 1832 кляштар скасаваны, у 1868 касцёл перароблены на царкву. У 1930-я г. будынкі знішчаны.

А.А.Ярашэвіч.

ЧА́ШНІЦКІ РАЁН. Размешчаны на Пд Віцебскай вобл. Утвораны 17.7.1924, скасаваны 25.12.1962, адноўлены 6.1.1965. Пл. 1,5 тыс. км^2. Нас. 39,6 тыс. чал. (2003), гарадскога 63%. Сярэдняя шчыльн. 26 чал. на 1 км^2. Цэнтр — г. *Чашнікі*. Раён уключае г. *Новалукомль*, р.п. *Акцябрскі*, 213 сельскіх нас. пунктаў, Новалукомльскі гарадскі Савет, Акцябрскі пасялковы Савет, 11 сельсаветаў: Альшанскі, Антапольеўскі, Іванскі, Краснаслуцкі, Кругліцкі, Латыголіцкі, Лукомль-

скі, Новазаранскі, Пачаевіцкі, Празямлянскі, Чарэйскі.

Тэр. раёна пераважна ў межах *Чашніцкай раўніны* з пласкахвалістай паверхняй, на ПдЗ і З узгорыстыя і платопадобныя ўчасткі *Лукомскага ўзвышша*. На выш. 125—160 м каля 50% паверхні, 160—200 м — 40% і больш за 200 м — 10%. Найвыш. пункт 242 м (за 4 км на ПдУ ад в. Дабрамыслі). Агульны нахіл з Пд на Пн. Карысныя выкапні: торф, гліны легкаплаўкія, буд. пяскі, пясчана-жвіровы матэрыял, сапрапель. Сярэдняя т-ра студз. -7,4 °С, ліп. 17,9 °С. Ападкаў 620 мм за год. Вегетац. перыяд 186 сут. Найб. рэкі: Ула з прытокамі Лукомка і Усвейка; Эса. Найб. азёры: *Лукомскае возера, Жэрынскае возера, Чарэйскае возера, Ямнае возера, Сцержань*. Вадасховішча Лукомскае. Глебы с.-г. угоддзяў: дзярнова-падзолістыя (45,6%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (31,6%), дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя 11,8%, тарфяна-балотныя і эловіяльныя (11%). Пад лесам 29.5% плошчы, з іх 13,7% штучныя (хваёвыя) насаджэнні. Пераважаюць хваёвыя, яловыя, бярозавыя, чорна- і шэраальховыя, асінавыя лясы; трапляюцца ясянёвыя, дубовыя і інш. Пад балотамі 4,2% плошчы, найб. балотныя масівы: Эса-Плінтаўка, Гурынскае, Абрубы-Чысцік. На тэр. раёна заказнікі: рэсп. значэння ландшафтны *Сялява* (частка), бат. мікразаказнікі мясц. значэння — Саснягі, Ліпнікі, Зялёнае Ляда. Помнікі прыроды мясц. значэння: крыніца «Святая вада» ў Чашніцкім лясніцтве, канглемерат ледавіковы «Змееў камень» у Кашчынскім лясніцтве.

Агульная пл. с.-г. угоддзяў 72,4 тыс. га, з іх асушаных 26,6 тыс. га. На 1.1.2003 у раёне 5 калгасаў, 8 саўгасаў, 20 фермерскіх гаспадарак, свінагадоўчы комплекс «Зара». Сельская гаспадарка спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, ільнаводстве. Вырошчваюць збожжавыя і кармавыя культуры, бульбу. Прадпрыемствы прам-сці: харч. (спірт-рэктыфікат, хлебабулачныя і малочныя вырабы), пач. апрацоўкі лёну (ільновалакно), буд. матэрыялаў (цэгла, керамзітавы жвір), паліўнай (торфабрыкет), цэлюлозна-папяровай (гафракардон), лёгкай (спецадзенне і інш.), электратэхн. (электрарухавікі, энергазберагальнае абсталяванне) і электраэнергетыкі (*Лукомская ДРЭС*). Па тэр. раёна праходзяць чыгунка Орша—Лепель з адгалінаваннем на Новалукомль; аўтадарогі Віцебск—Чашнікі—Новалукомль, Орша—Лепель; лініі электрапередач 330 кВт на Мінск, Віцебск, Магілёў, Оршу, Бабруйск, Полацк. У раёне 16 сярэдніх, 5 базавых, 3 пач. школы, ПТВ, 16 дашкольных устаноў, 21 клубная ўстанова, 30 б-к, 3 бальніцы, 2 паліклінікі, 3 амбулаторыі, 20 фельч.-ак. пунктаў, 1 санаторый-прафілакторый. *Чашніцкі гістарычны музей*. Помнікі архітэктуры: Троіцкая царква (мясц. назва Белая царква, пабудавана ў 16 ст., адноўлена ў 17 ст.) у в. Белая Царква; сядзіба (2-я пал. 19 — пач. 20 ст.) каля в. Палітаддзел. Выдасцца газ. «Чырвоны прамень».

Літ.: Памяць: Гіст.-дак. хроніка Чашніцкага р-на. Мн., 1997; Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Віцебская вобл. Мн., 1985.

Т.В.Пчолкіна, Г.С.Смалякоў.

ЧА́ШНІЦКІЯ БАІ 1812. Адбыліся ў *вайну 1812* 31 кастр. і 14 ліст. каля г. *Чашнікі* пры зліцці рэк Ула і Лукомка паміж рас. корпусам ген. П.Х.*Вітгенштэйна* (30 тыс. чал.), які рухаўся з Курляндскай губ., і франц. карпусамі маршалаў К.Віктора і Н.Ш.*Удзіно*. Мэта рас. войск — не дапусціць адступлення арміі Напалеона I цераз Полацк і Лепель. Франц. корпус Л.*Сен-Сіра* (Удзіно) пасля бою пад Полацкам адступаў ад горада, потым каля Чашнікаў аб'яднаўся з корпусам Віктора, які рухаўся з раёна Смаленска. Гэтыя карпусы (усяго каля 46 тыс. чал. пад агульным кіраўніцтвам Віктора) атрымалі загад вярнуць занятыя рас. войскамі Полацк і Лепель і адкінуць Вітгенштэйна за Зах. Дзвіну. У баі 31 кастр. рас. войскі адцяснілі франц. авангард за р. Лукомка, але, не маючы сувязі з М.І.Кутузавым, прыпынілі наступленне. У баі 14 ліст. рас. корпус паспяхова адбіў усе атакі франц. войск і ўтрымаў занятыя пазіцыі. На наступны дзень франц. карпусы пачалі адступленне па дарозе на Бешанковічы. План Напалеона быў сарваны.



ЧА́ШНІЦКІЯ БАІ 1943. Адбыліся паміж партызанамі і ням.-фаш. гарнізонам (каля 300 чал.) у г. *Чашнікі* 19—22 студз. і 19—21 кастр. ў Вял. Айч. вайну. 19 студз. 3 атрады (320 чал.) Чашніцкай партыз. брыгады «Дубава» блакіравалі гарнізон і на працягу 3 дзён вялі па ім гарматны агонь. Каб затрымаць падмацаванне гарнізону, што рухалася з в. Бачэйкава Бешанковіцкага р-на, 22 студз. партызаны ўзарвалі мост цераз р. Ула і распачалі бой. Аднак з-за перавагі сіл праціўніка з наступленнем цемнаты атрады адышлі ў размяшчэнне брыгады. Бой у кастр. — састаўная частка *Лепельскай аперацыі 1943*. У ноч на 20 кастр. 3 батальёны Смаленскага партыз. палка атакавалі гарнізон (каля 700 чал.) і выцеснілі праціўніка з займаемых пазіцый. Аднак ён, замацаваўшыся ў цагляных будынках касцёла, школы, дома культуры, бальніцы, арганізаваў 4 контратакі, якія былі адбіты партызанамі. Бой працягваўся больш за суткі, пакуль з г. Сянно да гітлераўцаў не падышло падмацаванне. Партызаны пад прыкрыццем дымавой заслоны адышлі. У г. Чашнікі на брацкай магіле партызан (27 чал.), што загінулі ў Ч.б., пастаўлены помнік.

М.Ф.Шумейка.

ЧАШЧАВІ́К Антон Баляслававіч (н. 1.1.1942, в. Тур'я Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. вучоны ў галіне біяхіміі чалавека і жывёл, сац. палітыкі Беларусі. Д-р біял. н. (1989), праф. (1994). Акад. Нью-Йоркскай АН (1996), Міжнар. сац. акадэміі (1998). Скончыў БДУ (1969). З 1979 у Бел. НДІ экспертызы працаздольнасці і арг-цыі працы інвалідаў. З 1981 у Бел. НДІ кардыялогіі (заг. лабараторыі). З 1997 нач. Цэнтра сац. праблем Ін-та сацыяльна-палітычных даследаванняў пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі. Навук. працы па распрацоўцы і ўкараненні фізіка-хім. метадаў дыягностыкі і лячэння сардэчна-са-

судзістых захворванняў і цукр. дыябету; палітыцы ў галіне аховы здароўя, адукацыі, мінімізацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

Тв.: Социальная сфера Республики Беларусь и Российской Федерации. Мн., 2000 (у сааўт.); Факторы риска последствий Чернобыльской катастрофы. Мн., 2001 (у сааўт.); Динамика социальных процессов Республики Беларусь за 10 лет. Мн., 2001 (у сааўт.).

ЧА́ШЧЫН Вадзім Леанідавіч (24.1.1949 г. Барабінск Новасібірскай вобл., Расія — 3.8.2003), бел вучоны ў галіне біяарганічнай хіміі. Д-р хім. н. (1986). Скончыў Томскі політэхн. ін-т (1971). З 1974 у Ін-це біяарган. хіміі Нац. АН Беларусі (з 1979 заг. лабараторыі, у 1989—99 нам. дырэктара, адначасова ў 1986—92 дырэктар доследнай вытв-сці). Навук. працы па даследаванні структуры і функцыі цытахром Р450-залежных сістэм біясінтэзу стэроідных гармонаў. Устанавіў першасную структуру шэрагу феradаксінаў, распрацаваў навук. асновы і тэхналогіі вытв-сці радыедыягнастычных набораў для медыцыны. Дзярж. прэмія Беларусі 1988.

Тв.: Молекулярная организация холестерингидроксилирующего цитохрома Р-450 митохондрий коры надпочечников: Хим. модификация бифункциональными реагентами... (у сааўт.) // Биоорган. химия. 1984. Т. 10, № 11; Иммунохимическое исследование холестерингидроксилирующей системы: Топология и стехиометрия компонентов электронтранспортной цепи в митохондриальной мембране (у сааўт.) // Биол. мембраны. 1987. Т. 4, №10. *С.А.Усанаў.*

ЧАЯ́НАЎ Аляксандр Васілевіч (30.1.1888, Масква — 3.10.1937), расійскі эканаміст-аграрнік, пісьменнік, мастацтвазнавец. Скончыў Маскоўскі с.-г. ін-т (1910), выкладаў у ім да 1930 (з 1918 праф.), а таксама ў Нар. ун-це імя А.Л.Шаняўскага (з 1911), у Камуніст. імя Свярдлова і ў Маскоўскім ун-тах. Заснавальнік (1915) і першы старшыня Цэнтр. т-ва льнаводаў. Нам. міністра земляробства ў Часовым урадзе (1917), старшыня савета Сельскасаюза (1919—20), чл. калегіі Наркамзема (1921—23). Дырэктар заснаванага ім НДІ с.-г. эканомікі і палітыкі (1922—28). У 1930 арыштаваны, у 1932 засуджаны на 5 гадоў папраўча-прац. лагераў, у 1937 Ваен. калегіяй Вярх. суда СССР прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны ў 1987. Паводле Ч., у аснову агр. рэформы павінны быць пакладзены 2 прынцыпы: найб. прадукцыйнасці нар. працы, што прыкладаецца да зямлі, і дэмакратызацыі размеркавання нар. даходу. Адмаўляючы і капіталізм, і «дзяржаўны сацыялізм», і «анархісцкі камунізм», ён лічыў, што забяспечыць ажыццяўленне абодвух прынцыпаў можа толькі кааперацыя, і таму будучы аграрны лад павінен быць кааператыўным. Прапаноўваў разумна спалучаць стыхійнае развіццё нар.-гасп. жыцця з дзярж. і грамадскімі мерапрыемствамі, бо лічыў, што асновай агр. буд-ва павінна стаць кааператыўная сял. гаспадарка. На яго думку, у адрозненне ад прам-сці высокая ступень канцэнтрацыі с.-г. вытв-сці нерэнтабельная, таму пажадана развіваць дробную і сярэднюю сял. гаспадарку. Погляды Ч. і яго школы былі аб'яўлены немарксісцкімі, а ён абвінавачаны ў жаданні захаваць індывід. сял. гаспадарку і абароне інтарэсаў кулацтва. Асн. працы: «Кароткі курс кааперацыі» (1915), «Што такое аграрнае пытанне?» (1917), «Асноўныя ідэі і формы арганізацыі сялянскай кааперацыі» (1919), «Арганізацыя сялянскай гаспадаркі» (1925). Аўтар вершаў, аповесцей, п'ес, сцэнарыяў, даследаванняў па гісторыі Масквы. Чл. т-ва «Старая Масква» (1920), адзін з заснавальнікаў Рус. т-ва сяброў кнігі, удзельнік распрацоўкі экспазіцыі Камунальнага музея. Сабраў багатую калекцыю зах. гравюр, на аснове якой напісаў кнігу-даведнік «Старая заходняя гравюра» (1926).

Тв.: Избр. произв. М., 1989; Избр. повести. М., 1989; Крестьянское хозяйство: Избр. труды. М., 1989; Избр. труды. М., 1991.

Літ.: Балязин В.Н. Профессор Александр Чаянов, 1888—1937. М., 1990; Н.Д.Кондратьев, Н.П.Макаров, А.В.Чаянов, А.Н.Челинцев: Указ. лит. М., 1988.

Н.К.Мазоўка.

ЧВЭРЦЬ, мера аб'ёму сыпкіх цел і вадкасцей, плошчы і даўжыні, якая выкарыстоўвалася да ўвядзення *метрычнай сістэмы мер*. У Расіі для сыпкіх цел (пераважна зерня, круп, мукі) 1 Ч.=2 *асьмінам*=8 чацверыкам=209,91 л; для вадкасцей 1 Ч.=$^1/_4$ вядра=3,0748 л. Як мера плошчы складала 0,5 *дзесяціны*, даўжыні — $^1/_4$ сажня (гл. *Сажань*), пазней — *аршына* (18 см). У ВКЛ у залежнасці ад велічыні гарца (гл. *Гарнец*), *бочкі віленскай*, мясцовасці, мэт (сяўба, гандаль і інш.) Ч. раўнялася 18, 36, 64, 72, 80 гарцам, $^1/_4$ бочкі віленскай; як мера плошчы вядома Ч. ў 4 службы і ў 1 *валоку*.

ЧВЭРЦЬТО́НАВАЯ СІСТЭ́МА, чвэрцьтонавая гама ў музыцы, від мікрахраматыкі, дзе актава дзеліцца на 24 часткі, а кожны паўтон — на 2 чвэрцьтоны. Натацыя Ч.с.: ♯ = $^1/_4$ тону ↑, ♯♯ = $^3/_4$ ↑, ♭ = $^1/_4$ тону ↓, ♭♭ = $^3/_4$ ↓ і г.д. Інтэрвалы Ч.с. былі пашыраны ў старажытнасці (энармоніка), адрадзіліся ў 16 ст., выкарыстоўваюцца з 20 ст. (К.Пендарэцкі, А.Хаба, інш. сучасныя кампазітары).

ЧВЯЛЁЎ Уладзімір Яфімавіч (н. 28.7.1932, г. Смаленск, Расія), бел. інжынер, канструктар і распрацоўшчык аўтамаб. тэхнікі. Акад. Бел. інж. тэхнал. акадэміі (1997). Засл. работнік прам-сці Беларусі (1984). Скончыў Бел. політэхн. ін-т (1955). З 1955 у СКБ-1 Мінскага аўтазавода (з 1977 нам. гал. канструктара, з 1985 гал. канструктар). З 1991 гал. канструктар Мінскага з-да колавых цягачоў. Вядучы распрацоўшчык велікагрузных паўпрычэпаў, сям'і цягачоў і спец. высокаўніфікаваных шасі для перавозкі буйнагабарытных грузаў. У 1990-я г. пад яго кіраўніцтвам створаны і серыйна выпускаюцца трансп. сродкі спец. прызначэння для нафтагазаздабычы, будаўніцтва, камунальнай гаспадаркі. Дзярж. прэмія СССР 1989.

Тв.: Минские колесные тягачи (разам з У.Парэчыным) // Авто. 1995. № 6; Автомобильная техника СКБ МАЗа и МЗКТ: Неизвестное об известном // Автомобильная пром-сть. 2000. № 8.

Літ.: Качук Н. Здесь рождаются ракетовозы... // Армия. 1999. № 3. *М.М.Касцюковіч.*

ЧЖАНДЗЯ́НЬ, горад у Кітаі; другая назва г. *Цзыбо*.

ЧЖАНЦЗЯКО́Ў, Калган, горад у паўн. ч. Кітая, у даліне р. Янхэ (бас. р. Янцзы), у прав. Хэбэй. 529 тыс. ж. (1990). Вузел шашэйных дарог. Цэнтр раёна авечкагадоўлі і здабычы жал. руды (бас. Лун'янь) і каменнага вугалю. Прам-сць: чорная металургія, маш.-буд., харч., шкляная.

ЧЖАН ЦЯНЬ (? — каля 103 да н.э.), кітайскі дыпламат і падарожнік. У 138 да н.э. накіраваны імператарам *У Дзі* з місіяй на З (у *Согд*) для заключэння саюза з плямёнамі юэчжаў супраць цюркамоўных качэўнікаў хуну, якія пагражалі Кітаю. Па дарозе схоплены хуну; пасля 10 гадоў палону ўцёк, акрамя юэчжаў наведаў дзяржавы Давань (Фергана) і Канцзюй (Харэзм) і ў 126 да н.э. вярнуўся ў Кітай. У 115 да н.э. ўзначаліў пасольства ў Сямірэчча, каб схіліць правіцеля племя усунь да саюза з Кітаем. Падарожжы Ч.Ц. апрача паліт. вынікаў (стварэнне кааліцыі супраць хуну) пашырылі ўяўленні кітайцаў аб навакольным свеце, спрыялі наладжванню паліт., эканам. і культ. сувязей з народамі Сярэдняй Азіі.

ЧЖА́О ЦЗЫЯ́Н (н. 17.10.1919, пав. Хуа, прав. Хунань, Кітай), кітайскі паліт. і дзярж. дзеяч. З 1950 на адказных пасадах у Паўд.-кіт. бюро ЦК Камуніст. партыі Кітая (КПК).З 1965 1-ы сакратар Гуандунскага правінцыяльнага к-та КПК. У час *«культурнай рэвалюцыі»* падвергнуты ад парт. чысткі і накіраваны на «перавыхаванне» ў вёску (1967—71); з 1971 зноў на парт. рабоце, у 1975 рэабілітаваны, з 1975 1-ы сакратар Сычуаньскага правінцыяльнага к-та КПК, набыў вядомасць эканам. рэформамі ў сельскай гаспадарцы. Чл. Палітбюро (1979—89), Пастаяннага к-та Палітбюро (1980—89) ЦК КПК. У 1980—88 старшыня Дзярж. савета Кітая. З ліст. 1987 ген. сакратар ЦК КПК. Садзейнічаў паляпшэнню адносін з СССР. У чэрв. 1989 зняты з усіх пасад за няздольнасць спыніць студэнцкія выступленні ў Пекіне. *В.У.Адзярыха.*

ЧЖОЎ, назва эпохі ў гісторыі Стараж. Кітая і кіт. дынастыі, якая правіла ў 11—3 ст. да н.э. Падзялялася на Зах. Ч. (1122—771 да н.э., сталіца каля сучаснага г. Сіянь) і Усх. Ч. (770—221 да н.э., сталіца каля сучаснага г. Лаян).

Першапачаткова стараж.-кіт. племя Ч. залежала ад дзяржавы *Інь*. У 1122 да н.э. (паводле сучаснай гістарыяграфіі 1137—911 да н.э.) правадыр Ч. У-Ван разграміў Інь, аб'яднаў усе плямёны і стварыў дзяржаву на тэр. бас. рэк Хуанхэ і Янцзы. Зах. Ч. была нетрывалым дзярж. утварэннем. Яе правіцелі раздавалі ўдзелы сваякам, прыхільнікам і саюзнікам вана (цара). Удзелы мелі аўтаномію, а вярх. правіцелю плацілі даніну і аказвалі ваен. дапамогу. Барацьба ўдзелаў з цэнтр. уладай і паміж сабою прывяла ў 8 ст. да н.э. да распаду дзяржавы. Усх. Ч. дзялілася на перыяды: Чуньцю (770—481 да н. э.) і Чжаньго (481—221 да н.э.). У перыяд Чуньцю ўлада вана была аслаблена барацьбой за гегемонію паміж асобнымі ўладарамі (чжухоў), якія толькі намінальна прызнавалі вяршэнства цара. У перыяд Чжаньго ўзнікла некалькі буйных царстваў, якія змагаліся за панаванне над усім Кітаем. Апошні цар Ч. пазбаўлены ўлады ў 256/255 да н.э., але фактычна перыяд Ч. завяршыўся ў 221 да н.э., калі краіна аб'яднана пад уладай дынастыі *Цінь*. Пры Ч. пачалося пашырэнне жалеза, развівалася ірыгацыйнае земляробства, аформіліся асн. філас.-рэліг. школы: *канфуцыянства, даасізм*, легізм (фацзя) і інш. *В.У.Адзярыха.*

ЧЖОЎ ЭНЬЛА́Й (5.3.1898, г. Хуаян, прав. Чжэцзян, Кітай — 8.1.1976), кітайскі паліт. і дзярж. дзеяч. Вучыўся ў Кітаі, Японіі і Францыі. З 1922 у Камуніст. партыі Кітая (КПК), чл. яе ЦК (з 1927), Палітбюро ЦК (з 1928). У *рэвалюцыю 1925—28 у Кітаі* кіраўнік ваен. аддзела КПК, паліт. кіраўнік *Наньчанскага паўстання 1927*. У 1927—32 на падп. рабоце ў г. Шанхай і прав. Гуансі, з 1932 паліт. камісар 1-га фронту Чырв. Арміі ў Цэнтр. сав. раёне (у час *Паўночна-заходняга паходу 1934—36* на пасадзе паліт. камісара яго змяніў *Мао Цзэдун*). У час антыяп. вайны 1937—45 прадстаўнік КПК пры гаміньданаўскім урадзе Кітая. Прэм'ер Дзярж. адм. савета (1949—54), міністр замежных спраў (1949—58), прэм'ер Дзярж. савета (1954—76) Кіт. Нар. Рэспублікі. Чл. Пастаяннага к-та Палітбюро ЦК КПК (1956—76), нам. старшыні КПК (1956—66, 1973—76).

Літ.: Тихвинский С.Л. Путь Китая к объединению и независимости, 1898—1949: По материалам биогр. Чжоу Эньлая. М., 1996. *В.У.Адзярыха.*

ЧЖУ ДЭ (6.11.1886, пав. Ілун, прав. Сычуань, Кітай — 6.7.1976), кітайскі ваенны, паліт. і дзярж. дзеяч. Маршал КНР (1955). Скончыў Юньнаньскае ваен. вучылішча (1911). У 1909 уступіў у рэв. арг-цыю *Тунмэнхой*, вучыўся ў Гётынгенскім ун-це (1922—24, Германія). Удзельнік *Сіньхайскай рэвалюцыі 1911—13*. Да 1922 афіцэр у войсках мілітарысцкіх груповак (камандзір брыгады). У 1925—26 у СССР. Потым у Кітаі, далучыўся да Нац.-рэв. арміі (НРА), удзельнічаў у *Паўночным паходзе 1926—28*. Адзін з кіраўнікоў *Наньчанскага паўстання 1927*. Сфарміраваў 4-ы корпус Чырв. арміі (з Мао Цзэдунам), з 1931 галоўнакаманд. Чырв. арміі Кітая. Ваен. кіраўнік *Паўночна-заходняга паходу 1934—36*. У час *Нацыянальна-вызваленчай вайны кітайскага народа супраць японскіх захопнікаў 1937—45* камандуючы 8-й арміяй, якая дзейнічала ў тыле яп. войск у Паўн. Кітаі. У ходзе *трэцяй грамадзянскай вайны ў Кітаі 1946—49* камандаваў узбр. сіламі КПК — Нац.-вызв. арміяй Кітая (НВАК), якая нанесла паражэнне рэжыму *Гаміньдана*. У 1945—54 галоўнакаманд. НВАК. У 1954—59 нам. старшыні КНР, з 1959 старшыня Пастаяннага к-та Усекіт. сходу нар. прадстаўнікоў. З 1934 чл. ЦК і чл. Палітбюро ЦК КПК, у 1956—69 і 1973—76 чл. Пастаяннага к-та ЦК КПК. Дачка Ч.Д. Чжу Мінь, прыехаўшы ў чэрв. 1941 у піянерскі лагер у Дзятлаўскім р-не Гродзенскай вобл., у час Вял. Айч. вайны знаходзілася да 1944 на тэр. Беларусі (была арыштавана ням.-фаш. захопнікамі, але не апазнана; пасля вызвалення хавалася ў мірных жыхароў і партызан). *В.У.Адзярыха.*

ЧЖУРЧЖЭ́НІ, чжурчжэнь, нюйчжэнь, нюйчжы, плямёны тунгуска-маньчжурскай моўнай групы, якія са старажытнасці насялялі ўсх. частку сучаснага Паўн.-Усх. Кітая (*Маньчжурыі*). У 10—11 ст. залежалі ад *кіданяў*. У пач. 12 ст. іх аб'яднаў правадыр Агуда, які ў 1114 узняў супраць кіданяў паўстанне. У выніку Ч. стварылі дзяржаву і дынастыю *Цзінь*, да сярэдзіны 12 ст. заваявалі Паўн. Кітай. У 1234 Цзінь знішчылі манголы (гл. *Мангольскія заваяванні*), а Ч. вярнуліся да племяннога ладу жыцця. У канцы 16 ст. хан Нурхацы [1582—1626] аб'яднаў Ч. ў адзіную дзяржаву. У 1636 хан Абахай [1626—43] даў ёй назву Цы, а Ч. сталі называцца маньчжурамі.

Літ.: Воробьев М.В. Чжурчжэни и государство Цзинь (X в. — 1234): Ист. очерк. М., 1975. *В.У.Адзярыха.*

ЧЖУЦЗЯ́Н, 1) адна з назваў р. *Сіцзян* на ПдУ Кітая. 2) Левы рукаў дэльты р. Сіцзян ніжэй сутокаў з р. Бэйцзян. Даўж. больш за 40 км, упадае ў бухту Чжуцзянкоў Паўд.-Кітайскага м., утварае эстуарый. Суднаходства, рыбалоўства, жамчужны промысел. Марскі порт Гуанчжоў (Кантон).

ЧЖУЦЗЯНКО́Ў, Кантонскі заліў. У Паўд.-Кітайскім м. каля паўд.-ўсх. ўзбярэжжа Кітая. Даўж. 63 км, шыр. каля ўваходу 31 км, глыб. да 26 м. Шмат астравоў і водмелей. Прылівы змешаныя да 2,5 м. Упадаюць шматлікія рукавы дэльты р. Сіцзян. На рукаве Чжуцзян — буйны порт Гуанчжоў (Кантон).

ЧЖУ ЮАНЬЧЖА́Н (храмавае імя Тайцзу; 1328—98), кітайскі імператар [1368—98], заснавальнік дынастыі *Мін*. З сям'і арандатара. У юнацтве быў будыйскім манахам. У 1352 у ходзе *«Чырвоных войск паўстання»* ўступіў у атрад паўстанцаў супраць манг. дынастыі *Юань*, з 1356 узначаліў увесь рух. Аб'яднаў пад сваёй уладай большасць зямель Кітая. У 1368 абвясціў сябе імператарам новай дынастыі (Мін), яго войскі занялі г. Даду (Пекін) і зверглі дынастыю Юань. Садзейнічаў аднаўленню эканомікі, найперш сельскай гаспадаркі, увёў фіксаваны зямельны падатак, аднавіў і пашырыў ірыгацыйную сетку, змагаўся са злоўжываннямі чыноўнікаў.

ЧЖЭН ХЭ (1371, прав. Юньнань, Кітай — каля 1434), кітайскі мараплавец, падарожнік і дыпламат. Мусульманін мангольскага паходжання. Здзейсніў 7 марскіх ваен.-гандлёвых экспедыцый (1405—07, 1407—09, 1409—11, 1413—15, 1417—19, 1421—22 і 1431—33) у краіны Індакітая, Індастана, Малайскага архіпелага, Аравійскага п-ва і Усх. Афрыкі. У складзе экспедыцый было ад 40 да 100 вял. караблёў і 27—30 тыс. удзельнікаў. Флатыліі адпраўляліся ўвосень і знаходзіліся ў плаванні прыкладна 2 гады. У час экспедыцый спец. атрады праводзілі здымкі наведаных тэрыторый, што з'явілася адным з гал. дасягненняў кіт. геагр. навукі. Падарожжы

Мадэль «лодкі скарбаў» з флоту **Чжэн Хэ**.

Чжэн Хэ апісаны ў кнігах яго спадарожнікаў Ма Хуаня (1416), Фэй Сіня (1436) і Гун Чжэня (1436).

ЧЖЭНЧЖО́Ў, горад у паўн. ч. Кітая, на Вял. Кітайскай раўніне. Адм. ц. прав. Хэнань. 1,2 млн. ж. (1990). Трансп. вузел. Буйны цэнтр машынабудавання і тэкст. прам-сці ў баваўнаводчым раёне. Прам-сць: чорная і каляровая металургія, хім., харчовая. У раёне Ч. здабыча кам. вугалю і жал. руды. Ун-т. Паблізу Ч. музей гісторыі металургіі стараж. Кітая.

ЧЖЭЦЗЯ́Н, правінцыя на У Кітая, на ўзбярэжжы Усх.-Кіт. мора. Пл. 101,8 тыс. км^2. Нас. 46,13 млн. ж. (2001). Адм. ц. — г. *Ханчжоў*. Большая ч. паверхні — горы (выш. да 1859 м), парэзаныя рачнымі далінамі. Уздоўж марскіх берагоў і на Пн (раён воз. Тайху) раўніны. Клімат субтрапічны, мусонны. Сярэдняя т-ра студз. 5 °С, ліп. 27 °С, ападкаў больш за 1000 мм за год. У гарах субтрапічныя лясы. Апрацоўваецца каля 25% тэр. Пераважае паліўное земляробства. Гал. культура — рыс; вырошчваюць пшаніцу, кукурузу, батат, джут, бавоўнік, цукр. трыснёг. Субтрапічнае садоўніцтва і чаяводства. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней, авечак, птушак. Шаўкаводства. Лясны промысел. Рыбаводства. Здабыча флюарыту, алуніту, жал. руды, солі (з марской вады). Прам-сць: лёгкая (шаўковая, джутавая, баваўняная, абутковая), рысаачышчальная, чаеапрацоўчая, машынабудаванне (абсталяванне для тэкст. прам-сці, судны, трактары, станкі), хім. і нафтахім., папяровая, шкляная, фарфаравая; выт-сць буд. матэрыялаў. Асн. прамысл. і партовыя гарады: Ханчжоў, Вэньчжоў, Нінбо (з аванпортам Чжэньхай).

ЧКА́ЛАЎ Валерый Паўлавіч (2.2.1904, с. Васілёва, цяпер г. Чкалаўск Ніжагародскай вобл., Расія — 15.12.1938), лётчык-выпрабавальнік, камбрыг (1938). Герой Сав. Саюза (1936). Вучыўся ў тэхн. вучылішчы ў г. Чарапавец (1915—18). Скончыў ваен.-авіяц. школы ў Барысаглебску (1923), Маскве і Серпухаве (абедзве ў 1924). З 1924 ваен. лётчык-знішчальнік, з 1928 лётчык-інструктар Ленінградскага авіяклуба, у 1930—38 (з перапынкамі) лётчык-выпрабавальнік Навук.-выпрабавальнага ін-та ВПС і шэрагу авіязаводаў. Майстар вышэйшага пілатажу, у якім распрацаваў і ўкараніў новыя фігуры — узыходзячы штопар і запаволеная «бочка». На самалёце АНТ-25 экіпаж у складзе Ч. (камандзір), Г.П.Байдукова (2-і пілот) і А.В.Белякова (штурман) упершыню ў свеце здзейсніў звышдалёкія беспасадачныя пералёты Масква—Петрапаўлаўск-Камчацкі—в-аў Уд (цяпер в-аў Чкалаў) у Ахоцкім м. (22—23.7.1936, 9374 км за 56 гадз 20 мін) і Масква—Паўн. Полюс—Ванкувер у ЗША (18—20.6.1937, 8504 км за 63 гадз 16 мін). Карыстаўся папулярнасцю ў СССР і свеце. Загінуў пры выпрабаванні новага самалёта-знішчальніка. Яго імем названы населеныя пункты, вуліцы, школы, у т.л. на Беларусі; у гады Вял. Айч. вайны імя Ч. насілі 2 брыгады і больш за 20 атрадаў бел. партызан.

Літ.: Беляков А.В. Валерий Чкалов. М., 1987; Байдуков Г.Ф. Чкалов. 5 изд. М., 1991. *М.Г.Нікіцін.*

В.П.**Чкалаў**.

ЧКА́ЛАЎСКАЕ РАДО́ВІШЧА НА́ФТЫ. У Светлагорскім і Рэчыцкім р-нах Гомельскай вобл. Адкрыта ў 1983. Распрацоўваецца з 1989. Прымеркавана да цэнтр. ч. Рэчыцка-Вішанскай зоны падняццяў на Пн Прыпяцкага прагіну. Мяжуе на З з Паўд.-Сасноўскім, на У з Паўд.-Асташкавіцкім радовішчамі. Прамысл. нафтаноснасць звязана з дэвонскімі міжсалявымі (задонскімі і ялецкімі) адкладамі. Глыб. залягання ялецкага рэзервуара 3870—4300 м. Пароды — калектары сярэдне- і буйназярністыя поравыя, дробнакавернозныя, у рознай ступені трэшчынаватыя даламіты. Нафта лёгкая, маласярністая, парафіністая, маласмалістая. *Я.Г.Грыбік.*

ЧКО́НІЯ Ламара Рыгораўна (н. 27.12.1930, г. Батумі, Аджарыя), грузінская і ўкраінская спявачка (лірыка-каларатурнае сапрана). Засл. арт. Украіны (1963). Нар. арт. СССР (1976). Скончыла Тбіліскую кансерваторыю (1956), выкладае ў ёй (з 1987 праф.). У 1956—60 і з 1968 салістка Грузінскага, у 1960—68 — Укр. т-раў оперы і балета. Валодае голасам прыгожага серабрыстага тэмбру. Яе творчасць вызначаецца высокай вакальнай тэхнікай, шчырасцю і пранікнёнасцю. Сярод партый: Маро, Этэры («Даісі», «Абесалом і Этэры» З.Паліяшвілі), Марфа («Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава), Таццяна, Іаланта («Яўген Анегін», «Іаланта» П.Чайкоўскага), Чыо-Чыо-сан («Чыо-Чыо-сан» Дж. Пучыні), Віялета («Травіята» Дж. Вердзі). Лаўрэат Усесаюзнага (1960, Масква) і Міжнар. (1963, Сафія; 1967, Токіо) конкурсаў вакалістаў.

ЧЛЕНІСТАНО́ГІЯ (Arthropoda), тып беспазваночных жывёл. 4 падтыпы: трылабітападобныя (з выкапнёвым кл. *трылабітаў*), *трахейнадыхальныя, хеліцэравыя, шчэлепадыхальныя*. Каля 3 млн. відаў. Пашыраны ўсюды, у т.л. на Беларусі. Жывуць у паветры, на паверхні зямлі, у глебе, вадзе. Найб. разнастайныя і шматлікія *насякомыя, ракападобныя, павукападобныя, мнаганожкі*.

Цела двухбакова-сім., сегментаванае, укрытае хіцінавай *кутыкулай*, якая ўтварае панцыр. У целе 3 аддзелы: галава, грудзі і брушка, якія ў розных камбінацыях зліваюцца паміж сабой. Перамяшчаюцца з дапамогай членістых канечнасцей (адсюль назва). Галаўныя канечнасці ператварыліся ў сківіцы. Органы дыхання — лёгачныя мяшкі, трахеі або шчэлепы. Крывяносная сістэма незамкнёная, у спінной ч. цела размешчана сэрца. У стрававальнай сістэме пярэдняя, сярэдняя і задняя кішкі з вываднымі адтулінамі; выдзяляльная сістэма прадстаўлена залозамі і *мальпігіевымі сасудамі*. Нерв. сістэма складаецца з галаўнога мозга, каляглотачных вузлоў і брушнога нерв. ланцуга. Многія Ч. маюць добра развітыя органы пачуццяў, у т.л. *фасетачныя вочы*, розныя механа- і хемарэцэптары, органы слыху. Размнажэнне палавое, зрэдку — шляхам *партэнагенезу*. Развіццё часта з *метамарфозам*. Рост магчымы праз перыядычныя *лінькі*. Большасць расліннаедныя, ёсць драпежнікі і паразіты. Многія Ч. карысныя: ядомыя, вытворнікі каштоўных прадуктаў, апыляльнікі раслін; выкарыстоўваюцца ў барацьбе са шкоднікамі с.-г. культур. Ёсць пераносчыкі ўзбуджальнікаў інфекц. хвароб жывёл і чалавека, шкоднікі с.-г. культур. Адыгрываюць важную ролю ў біясферы.

Літ.: Догель В.А. Зоология беспозвоночных. 7 изд. М., 1981; Жизнь животных. Т. 2—3. 2 изд. М., 1988, 1984. *Л.В.Кірыленка.*

ЧЛЕНІСТАСЦЯБЛО́ВЫЯ, тое, што *хвошчападобныя*.

ЧЛЕНІСТАШЫ́ЙНЫЯ, падклас вымерлых рыб; гл. *Артрадыры*.

ЧМШКЯН Георг Аруцюнавіч (19.3.1837, Тбілісі — 10.1.1916), армянскі акцёр, рэжысёр, драматург; заснавальнік рэаліст. арм. сцэн. мастацтва. У 1863 стварыў прафес. арм. т-р у Тбілісі, яго акцёр і рэжысёр. Сцэн. дзейнасць пачаў у 1862. Сярод лепшых роляў: Пэпо, Масісян, Мікаэл («Пэпо», «Хатабала», «Яшчэ адна ахвяра» Г.Сундукяна), Атэла, Шэйлак («Атэла», «Венецыянскі купец» У.Шэкспіра), Станарэль («Лекар паняволі» Мальера), Крачынскі («Вяселле Крачынскага» А.Сухаво-Кабыліна), Скалазуб («Гора ад розуму» А.Грыбаедава). Паставіў п'есу «Не ў свае сані не садзіся» А.Астроўскага (1864) і інш. Аўтар вадэвіляў, быт. камедый, драм («Настаўніца», 1890).

Чмялі: 1 — земляны; 2 — каменны; 3 — лугавы; 4 — палявы.

ЧМЯЛІ́ (Bombus), род насякомых сям. сапраўдных, ці высакародных, пчол, або пчаліных. Каля 300 відаў. Пашыраны пераважна на Пн Еўразіі, у Паўн. і Паўд. Амерыцы, Аўстраліі. Жывуць пераважна ў лясах і гарах. На Беларусі больш за 30 відаў. Найб. трапляюцца Ч.: земляны (B. terrestris), каменны (B. lapidarius), лясны (B. silvarum), палявы (B. agrorum), садовы (B. hortorum). 6 відаў Ч.: байкальскі (B. subbaicalensis), звычайны (B. proteus), мохавы (B. muscorum), фруктовы, або стэпавы (B. pomorum), чырванаваты (B. ruderatus), Шрэнка (B. schrenckii) — занесены ў Чырв. кнігу.

Даўж. да 3,5 см. Цела ўкрыта густымі доўгімі валаскамі, з чорнымі, белымі, ярка-рыжымі палосамі. Ротавыя органы грызуча-ліжучага тыпу. Развіта джала і ядавітыя залозы. Жывуць сем'ямі (100—200, зрэдку да 500 асобін), якія складаюцца з адной або некалькіх плодных самак (матак), самцоў і бясплодных самак (рабочых). Сем'і закладваюцца вясной. Гнёзды шарападобныя. Самка з сумесі воску і пылку будуе ячэйку для мёду. Рабочыя асобіны робяць новыя ячэйкі і гадуюць расплод. Увосень маладыя самцы і рабочыя асобіны гінуць. Аплодненыя самкі зімуюць, вясной будуюць гнёзды і закладваюць новыя сем'і. Кормяцца нектарам і пылком раслін. Апылятнікі некат. бабовых. Разводзяць штучна.

С.Л.Максімава.

ЧО́БАТ Алесь Фёдаравіч (н. 23.8.1959, г. Скідзель Гродзенскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў Бел. тэхнал. ін-т (1981). З 1981 працаваў у г. Гродна на прамысл. прадпрыемствах, з 1990 у друку, у 1995—98 у Літ. музеі М.Багдановіча. Друкуецца з 1990. Аўтар кн. паэзіі «Год» (1992), «Крэсавякі» (1993, з Д.Бічэль-Загнетавай), «Новая Галілея» (1995), «Ты не самотны...» (1997, з Бічэль-Загнетавай), кн. «Зямля св. Лукі» (2002), апавяданняў, нарысаў, эсэ, артыкулаў. Перакладае з польскай і рус. моў.

Тв.: Тутэйшая Сага. Смоленск; Гродна, 2000.

«ЧО́БАТЫ», бел. старадаўні нар. танец. Муз. памер 2/4. Тэмп ад умеранага да хуткага. Выконваўся пад музыку або пад прыпеўкі, часам адначасова пад музыку і прыпеўкі. Існавала некалькі тыпаў танца — ад абрадавага да сольнага. Выканаўца сольнага танца напачатку імітуе працэсы пашыву чобатаў, потым прытупвае то адной, то другой нагой, робіць скокі на дзвюх нагах у павароце і, стоячы на месцы, рухаецца па крузе бягом або павольна. Часта танец выконваецца на месцы, тады ён больш эмацыянальны і рухі больш складаныя. Існавалі варыянты, калі выканаўца дэманстраваў спрыт і фантазію, часам разам з дзяўчынай (Лельчыцкі, Жыткавіцкі р-ны Гомельскай вобл.). Танец насіў гумарыстычны характар. Абрадавы тып «Ч.» — частка традыц. вясельнага абраду (пашыраны на Прыпяцкім Палессі). Выконваўся бацькамі маладой пасля таго, як зяць абдорваў цешчу і цесця (некалі абуткам). Пад воклічы гасцей бацькі пераабуваліся, потым іх на ўслоне падымалі ўверх і абносілі вакол сталоў. Бацькі ў гэты час махалі нагамі, стукалі нагой аб нагу і інш. Пасля завяршэння круга ўслон ставілі на падлогу, а бацькі працягвалі імправізаваць свой танец. Падчас яго выканання госці спявалі прыпеўкі. Кожнай мясцовасці ўласцівы свой варыянт танца. Яго сцэн. варыянт уваходзіць у рэпертуары некат. прафес. і аматарскіх калектываў Беларусі.

М.А.Козенка.

ЧО́ВЕН, у беларусаў лодка, выдзеўбаная з дрэва (хвоі, асіны, дубу і інш.). Наз. таксама дуб. Пашыраны сродак воднага транспарту; служыў для мясц. перавозак грузаў і людзей, рыбнай лоўлі, палявання. Памеры Ч. (ад 2,5 да 10 м даўжыні і 1—1,5 м шырыні) залежалі ад прызначэння і шырыні ракі ці канала. Кіравалі Ч. адналопасным вяслом без уключын. Бытавалі Ч. карытападобнай формы (бас. Нёмана), у інш. мясцовасцях — з разгорнутымі бакамі, завостранымі або злёгку закругленымі насамі і кармой. У 19 ст. выцеснены дашчанымі лодкамі, выйшаў з ужытку ў 20 ст. Вядомы таксама рускім, украінцам і інш.

Н.І.Буракоўская.

ЧО́ЛА, старажытная дзяржава на Пд Індыі і дынастыя, якая ў ёй правіла.

Човен на Берштаўскім возеры. Шчучынскі раён Гродзенскай вобл.

Човен на Прыпяці.

Вядома з 1 ст. н.э. Сталіцы: Пухар, Танджур і Гангайкондачалапурам. Дзярж. мова — тамільская. У 9 ст. трапіла ў васальную залежнасць ад дзяржавы Палаваў. Узвышэнне Ч. пачалося, калі яе правіцель Адыцья I [871—907] знішчыў дзяржаву Палаваў і захапіў яе тэр. Найб. магутнасці дасягнула ў 10—12 ст., калі дынастыя Ч. падпарадкавала амаль увесь Пд п-ва Індастан, в-аў Шры-Ланка (Цэйлон), Мальдыўскія а-вы, нанесла некалькі паражэнняў дзяржаве Зах. Чалук'яў, здзейсніла паходы ў Бенгалію, на Суматру і ў Малаю. Высокага развіцця дасягнулі земляробства, рамесніцтва і гандаль, тамільская л-ра і мастацтва. З 2-й пал. 12 ст. пачаўся заняпад дзяржавы Ч., у 13 ст. яна стала васалам Хайсалаў і перастала існаваць. Дынастыя вядома да 18 ст.

ЧО́МПІ (італьян. ciompi), часальшчыкі воўны і інш. наёмныя рабочыя сукнаробчых мануфактур Фларэнцыі і шэрагу інш. гарадоў Італіі 14 ст. Яны складалі каля 25% насельніцтва Фларэнцыі. Працавалі па 14—16 гадз у сут за мізэрную плату. Уладальнік мануфактуры мог звольніць іх без папярэджання. Ч. не былі членамі цэха і не мелі ніякіх паліт. правоў. У чэрв. 1378 у Фларэнцыі Ч. ўзнялі паўстанне, патрабуючы стварэння свайго цэха, увядзення сваіх прадстаўнікоў у гар. ўрад (*сіньярыю*), павышэння зарплаты, адтэрміноўкі даўгоў і інш. У канцы жн. 1378 паўстанне было задушана, яго кіраўнікі пакараны смерцю.

ЧОН ДУ ХВАН (н. 18.1.1931, прав. Кёнсан-Намдо, Рэспубліка Карэя), дзяржаўны і ваен. дзеяч Рэспублікі Карэя. Ген. (1978). Скончыў Карэйскую ваен. акадэмію (1955), служыў у арміі. Камандаваў паўд.-кар. войскамі ў Паўд. В'етнаме ў 1960-я г. Кіраваў расследаваннем забойства прэзідэнта *Пак Чжон Хі* (26.10.1979), што выкарыстаў для расправы з паліт. канкурэнтамі. У маі 1980 узначаліў дзярж. пераварот, жорстка падавіў нар. паўстанне ў г. Кванчжу. У жн. 1980 прымусіў парламент выбраць сябе прэзідэнтам Рэспублікі Карэя (1980—88). Працягваў эканам. палітыку Пак Чжон Хі, якая спрыяла хуткаму росту эканомікі, паступова змякчаў паліцэйскі рэжым. З 1988 у адстаўцы. У 1995 арыштаваны і прыгавораны да смяротнага пакарання (заменена пажыццёвым зняволеннем) за масавыя забойствы у г. Кванчжу ў 1980 і карупцыю ў час яго прэзідэнцтва. Памілаваны ў 1998.

В.У.Адзярыха.

ЧО́НКІ, вёска ў Гомельскім р-не, на левым беразе р. Сож, каля аўтадарогі Гомель—Чарнігаў (Украіна). Цэнтр сельсавета. За 2 км на Пд ад украіны Гомеля. 2655 ж., 906 двароў (2003). Базавая школа, Дом культуры, 2 б-кі, амбулаторыя, аддз. сувязі. Брацкая магіла

сав. воінаў. Помнік у гонар Бел. штаба партыз. руху, які ў лют.—ліп. 1944 размяшчаўся ў вёсцы. У 18 — пач. 20 ст. ў Ч. знаходзіўся вядомы манастыр (спачатку стараабрадніцкі, потым аднаверскі, з 1899 — праваслаўны).

ЧО́НКІ, кліматычны курорт у Гомельскай вобл., за 15 км ад г. Гомель, на беразе р. Сож, паблізу вял. масіву хваёвага і мяшанага лесу. Засн. ў 1923 у радавым маёнтку *Бонч-Бруевічаў*. Клімат умерана кантынентальны. Лек. фактары: спрыяльны клімат і ландшафтныя ўмовы. Пясчаны пляж. Уключае санаторый для лячэння неактыўных форм туберкулёзу, дом адпачынку, абл. дзіцячы рэўматалагічны санаторый, турбазу.

ЧОП звычайны (Zingel, або Aspro zingel), рыба сям. акунёвых атр. акунепадобных. Пашыраны ў р. Дунай і яго прытоках і ў р. Днестр.

Чоп.

Даўж. да 40—48 см. Цела верацёнападобна-цыліндрычнае, шаравата-жоўтае, на баках 4 цёмна-бурыя паласы. Грудзі голыя, бруха і часткова галава ўкрыты луской. Покрыўная косць заканчваецца шыпам. Задні край перадпокрыўкі зубчасты. Бакавая лінія працягваецца і на хваставы плаўнік. Корміцца беспазваночнымі і дробнай рыбай.

ЧО́ПІЧ Бранка (1.1.1915, в. Хашані, Боснія і Герцагавіна — 15.2.1984), сербскі пісьменнік. Чл.-кар. Сербскай акадэміі навук і мастацтваў (1967), чл. АН Босніі і Герцагавіны (1973). Скончыў Бялградскі ун-т (1940). Друкаваўся з 1929. У зб-ках «Пад Грмечам» (1938), «Змагары і ўцекачы» (1939), «Горцы» (1940) і інш. выступіў як майстар рэаліст. навелы, адметнай гумарам. Раманы «Прарыў» (1952), «Глухі порах» (1957), зб-кі апавяд. «Прыгоды Нікалеціны Бурсача» (1956), «Сад у колеры мальвы» (1970) пра антыфаш. барацьбу югасл. народа. У раманах «Не сумуй, бронзавая варта» (1958), «Восьмае наступленне» (1964) актуальныя праблемы паслявае. рэчаіснасці. Аўтар зб-каў паэзіі «Вогненнае нараджэнне айчыны» (1944), «Спеўны цвыркун» (1955), «Чароўны лес» (1962) і інш., якім уласціва элегічнасць; твораў для дзяцей, п'ес, кінасцэнарыяў. На бел. мову асобныя яго вершы і апавяданні пераклалі У.Паўлаў, І.Чарота.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Поціск рукі. Мн., 1991; Рус. пер. — Избранное. Т.1—2. М., 1982. *І.А.Чарота.*

ЧОРНААЛЬХО́ВЫЯ ЛЯСЫ́, чорнаалешнікі, фармацыя карэнных лісцевых лясоў, у дрэвастоі якіх пераважае *вольха* чорная. На Беларусі займаюць 646,7 тыс. га (8,2 % агульнай пл. лясоў). Найб. буйныя масівы Ч.л. на Палессі, у Бярэзінскім біясферным запаведніку, Белавежскай і Налібоцкай пушчах. Растуць на нізінных балотах з глебамі ад перагнойна-глеевых да глыбокіх тарфяных. У падлеску пераважаюць крушына ломкая, рабіна, парэчкі чорныя і каласковая, вярба попельная, лящына, маліна, каліна і інш. Вылучаюць асн. тыпы Ч.л.: вятроўнікавы, асаковы, крапіўны, папарацевы, кіслічны, сніткавы, балотна-папарацевы, вербняковы, касачовы. Большасць тыпаў Ч.л. вызначаюцца высокай прадукцыйнасцю, даюць драўніну для фанернай і мэблевай вытв-сці, піламатэрыялы. Маюць водарэгулявальнае значэнне, умацоўваюць берагі рэк і азёр. *А.А.Малажаўскі.*

Чорнаальховы лес.

ЧО́РНА-БУ́РЫ ТРУС, парода трусоў мяса-шкуркавага кірунку. Выведзена ў Бірулінскім зверасаўтасе (Татарстан) скрыжаваннем парод *венскі блакітны трус, белы волат* і фландр. На Беларусі гадуюць аматары.

Жывёлы буйныя, моцнага целаскладу, хуткаспелыя. Даўж. тулава каля 60 см, маса 5 (да 7) кг. Валасяное покрыва густое, цёмна-бурае з цёмнымі бліскучымі канцамі восцевых валасоў, якія ўтвараюць густую чорную «вуаль»; падобнае да футра чорна-бурага ліса. Самка нараджае 7—8 трусянят.

Чорна-буры трус.

Чорнаваллёвік.

ЧОРНАВАЛЛЁВІК (Calidris alpina), птушка сям. бакасавых атр. сеўцападобных. Пашыраны пераважна ў арктычнай зоне Еўразіі і Паўн. Амерыкі. Жыве на вільготных лугах і балотах. На Беларусі рэдкі пралётны і залётны від, занесены ў Чырв. кнігу.

Даўж. да 23 см, маса да 57 г. Самкі буйнейшыя за самцоў. Апярэнне спіны чорнабурае з шырокімі рыжымі верхавінкамі пёраў. Надхвосце бурае, падхвосце белае з ледзь прыкметнымі цёмнымі стракацінкамі. Брушка ў асн. белае, на пярэдняй частцы — вял. буравата-чорная пляма (адсюль назва). Валяк, грудзі і шыя белыя з падоўжнымі цёмнымі стракацінамі. Дзюба доўгая, тонкая, крыху загнутая ўніз. Нясе 3—5 яец. Корміцца дробнымі беспазваночнымі. *Э.Р.Самусенка.*

ЧОРНАГАЛО́ВІК, шапкавы грыб; тое, што *падбярозавік*.

ЧОРНАГАЛО́ВІК, чорнагалоў (Prunella), род кветкавых раслін сям. ясноткавых. 5—7 відаў. Пашыраны ва ўмераным і субтрапічным паясах Паўн. паўшар'я. На Беларусі 2 віды Ч.: буйнакветны (P. grandiflora) і звычайны, або

Чорнагаловік звычайны.

гарлянка (P. vulgaris). Трапляюцца ў лясах, хмызняках, па берагах рэк, каля жылля.

Шматгадовыя травяністыя расліны з паўзучымі карэнішчамі. Сцёблы прамастойныя або прыўзнятыя, часам галінастыя. Лісце супраціўнае, ад суцэльнага да перыстараздзельнага. Кветкі ў несапраўдных кальчаках, што ўтвараюць густое коласападобнае верхавінкавае суквецце. Плод — арэшак. Лек., меданосныя, дэкар. расліны.

ЧО́РНАЕ, радовішча жвірова-пясчанага матэрыялу ў Шклоўскім р-не Магілёўскай вобл., паміж вёскамі Аляксандраўка, Лутна і Чорнае. Пластападобны паклад звязаны з надмарэннымі флювіягляцыяльнымі адкладамі сожскага гарызонту. Жвірова-пясчаны матэрыял жаўтавата-шэры, з лінзамі карычнявата-бурага, ажалезненага, месцамі гліністы, з праслоямі пяску; кандыцыйнага жвіру 12,5—55,7%. Пясок у сумесі розназярністы, палевашпатава-кварцавы. Разведаныя запасы 8,5 млн. м^3. Магутнасць карыснай тоўшчы 2,2—14,6 м, ускрышы (пяскі гліністыя, супескі тонкія) 0,2—5,5 м. Жвірова-пясчаны матэрыял прыдатны на выраб бетону, у дарожным буд-ве. *А.П.Шчураў.*

ЧО́РНАЕ ВО́ЗЕРА. У Бярозаўскім р-не Брэсцкай вобл., у бас. р. Жыгулянка (цячэ праз возера), за 2,5 км на У ад г. Белаазёрск, за 17 км на ПдУ ад г. Бяроза. Пл. 17,3 км^2, даўж. 6,4 км, найб. шыр. 3,4 км, найб. глыб. 2,5 м. Пл. вадазбору 539 км^2. Катлавіна авальная, выцягнутая з Пн на Пд. Схілы катлавіны выш. да 4 м, параслі лугавой і балотнай расліннасцю, часткова лесам. Берагі нізкія, забалочаныя. Дно плоскае, сапрапелістае. Зарастае па ўсёй плошчы. Упадаюць некалькі каналаў і ручаёў.

Чорнае возера ў Бярозаўскім раёне Брэсцкай вобл.

ЧО́РНАЕ ВО́ЗЕРА. У Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., на мяжы з Пскоўскай вобл. Расіі, у бас. р. Обаль, за 4 км на З ад г.п. Езярышча, за 40 км на Пн ад г. Гарадок. Пл. 1,56 км^2, даўж. 2,83 км, найб. шыр. 780 м, найб. глыб. 2,5 м, даўж. берагавой лініі 7,6 км. Пл. вадазбору 4,49 км^2. Катлавіна тэрмакарставага тыпу, складаецца з 2 плёсаў, злучаных вузкім пралівам: невял. акруглага ўсх. і выцягнутага з Пн на Пд заходняга. Схілы катлавіны на Пд выш. да 30 м, стромкія, на ПнЗ 5—7 м, спадзістыя, пясчаныя, укрытыя лесам. На Пн і Пд тэраса выш. 1 м. Берагі пераважна сплавінныя, на Пд, ПдУ і ПнЗ нізкія, пясчаныя і тарфяністыя. Пойма шыр. ад 50 да 300 м, месцамі забалочаная, парослая лесам. Дно плоскае, сапрапелістае. Востраў пл. 0,1 га. Зарастае па ўсёй плошчы. Выцякае ручай Чарнуля (злучае з воз. Іса).

ЧО́РНАЕ ВО́ЗЕРА. У Міёрскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дзісна, за 18 км на ПдУ ад г. Міёры, у межах гідралагічнага заказніка *Ельня*. Пл. 0,7 км^2, даўж. 1,8 км, найб. шыр. 860 м, найб. глыб. 3,7 м, даўж. берагавой лініі 4,9 км. Пл. вадазбору 23,5 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу, выцягнутая з ПнУ на ПдЗ. Схілы катлавіны невыразныя. Берагі нізкія, пясчаныя, забалочаныя. Дно плоскае, у зах. частцы тарфяністае, ва ўсх. пясчана-камяністае, у цэнтры сапрапелістае. Слаба зарастае. Упадае пратока з воз. Ельня, выцякае р. Яльнянка.

ЧО́РНАЕ ВО́ЗЕРА. У Бялыніцкім р-не Магілёўскай вобл., у бас. р. Аслік, сярод забалочанага лесу, за 1,5 км на Пд ад в. Гордава, за 15 км на ПдЗ ад г. Бялынічы. Пл. 0,57 км^2, даўж. 1,17 км, найб. шыр. 700 м, даўж. берагавой лініі 3 км. Пл. вадазбору 14,2 км^2. Катлавіна акруглай формы. Схілы катлавіны невыразныя. Берагі забалочаныя.

ЧО́РНАЕ ВО́ЗЕРА. У Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дахнарка, каля в. Гендзікі, за 8 км на Пн ад г. Полацк. Пл. 0,4 км^2, даўж. 1 км, найб. шыр. 600 м. Катлавіна авальная, выцягнутая з З на У. Схілы катлавіны спадзістыя, выш. да 2 м, пад лесам, на Пн пад хмызняком. Злучана пратокай з воз. Белае.

ЧО́РНАЕ ВО́ЗЕРА. У Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Званіца, каля в. Лагуны, за 22 км на ПнЗ ад г. Полацк. Пл. 0,4 км^2, даўж. 1,2 км, найб. шыр. 500 м, даўж. берагавой лініі 3 км. Пл. вадазбору 2,12 км^2. Катлавіна выцягнутая з З на У. Схілы катлавіны выш. да 25 м, стромкія, пад хмызняком. Бяссцёкавае.

ЧО́РНАЕ ВО́ЗЕРА. У Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Галбіца, каля в. Чорнае, за 27 км на У ад г. Паставы. Пл. 0,36 км^2, даўж. 1,5 км, найб. шыр. 500 м, найб. глыб. 31,5 м, даўж. берагавой лініі 3,83 км. Пл. вадазбору 9,39 км^2. Катлавіна падзяляецца на 2 плёсы, выцягнутая з ПдУ на ПнЗ. Схілы катлавіны выш. да 6 м, спадзістыя, пад хмызняком і лугам, участкамі на У і З разараныя. Берагі нізкія, пясчана-тарфяністыя, на ПнУ і ПдЗ забалочаныя. Дно да глыб. 5 м пясчанае, ніжэй ілістае. Зарастае ўздоўж берагоў і на мелкаводдзі паміж плёсамі, шыр. паласы расліннасці да 120 м. Упадае ручай, выцякае ручай у р. Чэртка.

ЧО́РНАЕ ВО́ЗЕРА. У Лунінецкім р-не Брэсцкай вобл., у бас. р. Цна, за 5 км на ПдЗ ад в. Бастынь, за 12 км на ПнЗ ад г. Лунінец. Пл. 0,31 км^2, даўж. 680 м, найб. шыр. 600 м, даўж. берагавой лініі 1,95 км. Катлавіна круглая, схілы выш. да 2 м, пад лесам. Берагі нізкія, забалочаныя. Дно сапрапелістае.

ЧО́РНАЕ ВО́ЗЕРА. У Докшыцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Патачанка, за 1 км на Пд ад в. Замошша, за 26 км на З ад г. Докшыцы. Пл. 0,28 км^2, даўж. 660 м, найб. шыр. 640 м, найб. глыб. 2,4 м, даўж. берагавой лініі 2,04 км. Пл. вадазбору 5,9 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу, круглаватая. Схілы катлавіны невыразныя. Дно чашападобнае, выслана сапрапелем. Зарасло. Злучана меліярац. канавай з воз. Станіслаўскае.

ЧО́РНАЕ ВО́ЗЕРА. У Верхнядзвінскім р-не Віцебскай вобл., на мяжы з Латвіяй, у бас. р. Росіца (цячэ праз возера), за 1,5 км на З ад в. Крывасельцы, за 24 км на ПнЗ ад г. Верхнядзвінск. Пл. 0,2 км^2, даўж. 750 м, найб. шыр. 300 м, даўж. берагавой лініі 1,9 км. Пл. вадазбору 12,5 км^2. Злучана канавай з воз. Белае.

ЧО́РНАЕ МО́РА, міжземнае мора Атлантычнага ак., паміж Еўропай і М.Азіяй. На ПнУ Керчанскім прал. злучана з Азоўскім м., на ПдЗ пралівам Басфор — з Мармуровым м. і далей цераз праліў Дарданелы з Эгейскім і Міжземным морамі. Абмывае берагі Расіі, Украіны, Грузіі, Румыніі, Балгарыі і Турцыі. Пл. 422 тыс. км^2. Сярэдняя глыб. 1300 м, найб. глыб. 2210 м. Берагі парэзаны мала, на Пн адзіны буйны п-аў Крымскі. На З і ПнЗ берагі нізкія, на У і Пд да мора ўшчыльную падыходзяць горы Вял. і М. Каўказа і Пантыйскія горы. Паўд. бераг Крымскага п-ва гарысты. Найб. буйныя залівы каля паўн.-зах. берагоў: Каркініцкі, Каламіцкі, Дняпроўска-Бугскі, Дністроўскі, Варненскі, Бургаскі, каля паўднёвых — Сінопскі і Самсунскі. Астравоў мала, найб. значныя Беразань і Змяіны. Упадаюць буйныя рэкі: Дунай, Днестр, Паўд. Буг, Дняпро, Рыёні, Кызыл-Ірмак.

Рэльеф дна — катлавіна са стромкімі схіламі, акружаная вузкай паласой мацерыковай водмелі, якая расшыраецца ў паўн.-зах. ч.

(глыб. 100—200 м). Клімат паўн. ч. ўмераны з адносна мяккай зімой і цёплым летам; паўд. ч. — субтрапічны з цёплай дажджлівай зімой і тарачым сухім летам. Зімой урываецца кантынент. палярнае паветра, што суправаджаецца ападкамі і халоднымі паўн. і паўн.-ўсх. вятрамі, асабліва моцнымі ў раёне г. Новарасійск, дзе іх наз. *бара*. Сярэдняя т-ра паветра ў студз. ў цэнтр. ч. мора каля 8 °С, каля ўсх. берагоў 6 °С, каля паўн.-зах. — 3 °С, на ПдУ і Пд — 6—9 °С; у ліп. — 22—24 °С. Колькасць ападкаў на З і ПнЗ 300—500 мм, на У і ПдУ 1500—2500 мм, на Пд 750—800 мм за год. Восенню бываюць моцныя смерчы. Т-ра вады на паверхні ў адкрытым моры зімой 6—8 °С, на ПнЗ і на Пд ад Керчанскага праліва — да 0,5 °С. Летам т-ра вады 22—25 °С. Салёнасць вады каля 18 ‰, паблізу вусця рэк 3—9 ‰. Ільды ўтвараюцца зімой у заліве паўн.-зах. і паўн.-ўсх. частак. Прыліўныя ваганні ўзроўню не перавышаюць 10 см, сейшавыя — не больш за 60 см. На глыб. больш за 150 м у вадзе ёсць сераводарод, канцэнтрацыя якога каля дна дасягае 11—14 мл/л, таму на вял. глыбінях у моры жывых арганізмаў няма, акрамя анаэробных бактэрый. Цячэнні непастаянныя, залежаць ад вятроў. Пераважае агульны цыклянічны характар руху вады 2 кругаваротаў зах. і ўсх. ч. мора. Расл. і жывёльны свет прыстасаваны да паверхневага слоя вады. У Ч.м. да 160 відаў рыб, з якіх прамысл. значэнне маюць хамса, стаўрыда, скумбрыя, пеламіда, шпрот, асятровыя, кефалі і інш. Водзяцца звычайная калючая акула, або катран, дэльфіны, цюлень-манах.

Асн. порты: Адэса, Ілычоўск (Украіна), Новарасійск (Расія), Поці, Батумі (Грузія), Канстанца (Румынія), Варна, Бургас (Балгарыя), Трабзон, Сіноп (Турцыя). На ўзбярэжжы шматлікія курорты: *Паўднёвага берага Крыма* (Украіна), *Чарнаморскага ўзбярэжжа Каўказа* (Расія, Грузія), *Залатыя Пяскі* і *Сонечны Бераг* (Балгарыя), Мамая (Румынія) і інш.

ЧО́РНА-ПЯРЭ́СТАЯ ПАРО́ДА буйной рагатай жывёлы, пародa малочнага кірунку. Выведзена ў розных рэгіёнах Еўразіі скрыжаваннем мясц. жывёлы з чорна-пярэстымі пародамі галандскага паходжання. Вылучаюць пародныя адгалінаванні (сярэднярус., уральскае, сібірскае і прыбалтыйскае) і групы (Беларусі, Украіны, Расіі і інш.), якія адрозніваюцца экстэр'ерам, надоямі і тлустасцю малака. Бел. пародная група Ч.-п. выведзена ў Бел. НДІ жывёлагадоўлі (М.П.Грынь, А.М.Якусевіч, І.М.Каранец), складае больш за 98% пагалоўя буйн. раг. жывёлы на Беларусі. Асн. племянныя гаспадаркі: «Чырвоная зорка» Клецкага р-на Мінскай вобл., «Рось» Ваўкавыскага р-на і «Карэлічы» Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл. і інш.

Чорна-пярэстая парода.

Жывёлы буйныя. Целасклад прапарцыянальны, канстытуцыя дужая, касцяк і мускулатура добра развітыя. Тулава падоўжанае. Спіна шырокая, шыя сярэдняй даўжыні, тонкая. Вымя прапарцыянальнае, пераважна чашападобнае. Масць чорна-пярэстая. Маса быкоў 850—1050 кг, кароў 450—500 кг. Скараспелыя, добрая мясная прадукцыйнасць, забойны выхад 55—57%, надоі малака за год 3000—4000 кг (патэнцыяльна да 7000), тлустасць 3,5—3,6%.

ЧО́РНАЯ, рака ў Карэліцкім і Навагрудскім р-нах Гродзенскай вобл., пра-

вы прыток р. Нёман. Даўж. 27 км. Пачынаецца ва ўрочышчы Касавец, за 5 км на ПнУ ад в. Антанёва Карэліцкага р-на, цячэ пераважна праз лес, упадае ў Нёман на У ад в. Гнесічы Навагрудскага р-на. Пойма часткова забалочаная. Рэчышча на працягу 7 км перад вусцем каналізаванае. У ніжнім цячэнні ў час разводдзя праз групу азёр Юзькавічы магчымы пераліў у р. Бойная.

ЧО́РНАЯ, рака ў Мсціслаўскім р-не Магілёўскай вобл., правы прыток р. Віхра (бас. р. Дняпро). Даўж. 21 км. Пл. вадазбору 99 км^2. Пачынаецца за 800 м на ПдУ ад в. Судоўшчына, вусце за 1,5 км на ПдУ ад в. Банькаўшчына. Рэчышча на працягу 700 м ніжэй аўтадарогі Мсціслаў—Горкі і паміж вёскамі Старое Сяло і Дзеснакіта (2,5 км) каналізаванае.

ЧО́РНАЯ БУ́РА, разбурэнне і перанос моцным ветрам верхняга ворнага слоя (мае цёмную афарбоўку) глебы; адна з форм ветравой *эрозіі глебы*. Ч.б. характэрны для стэпавай зоны.

ЧО́РНАЯ ГА́НЧА, рака ў Польшчы і Гродзенскім р-не Беларусі, левы прыток р. Нёман. Даўж. 145 км, пл. вадазбору 1916 км^2 (у межах Беларусі даўж. 35 км і пл. вадазбору 178 км^2). Пачынаецца ў Польшчы на паўд. схіле Балтыйскай грады, цячэ праз азёры Ганча і Вігры, перасякае граніцу за 1 км на ПдЗ ад в. Лясная. Вусце за 1 км на ПнЗ ад в. Загорнікі. Злучана праз *Аўгустоўскі* канал з р. Нёман. У Беларусі цячэ па паўн. схілах Гродзенскага ўзв. і зах. частцы Сярэднянёманскай нізіны. Асн. прыток — р. Марыха (злева). Пад лясамі 84% тэр. вадазбору. Даліна шыр. 0,7—3,5 км, глыбока ўрэзаная. Пойма шыр. 0,2—1 км, двухбаковая, забалочаная, парасла хмызняком; ёсць участкі надпоймавых тэрас выш. да 10 м. Рэчышча (шыр. да 10 м) звілістае, з буйнымі меандрамі. Выш. берагоў ад 0,5 да 3 м. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэднегадавы расход вады ў вусці 17 м^3/с. Сярод рыб харыус, стронга ручаёвая (у Чырв. кнізе Беларусі).

А.А.Макарэвіч.

Рака **Чорная Ганча**.

ЧО́РНАЯ МЕТАЛУ́РГІЯ, галіна цяжкай прамысловасці, прадпрыемствы якой вырабляюць *чыгун, сталь, пракат*, стальныя і чыгунныя трубы, *ферасплавы*, метал. вырабы прамысл. прызначэння; састаўная частка *металургічнай прамысловасці*. Да Ч.м. адносяцца таксама падгаліны па здабычы жал., марганцавай руд і па вытв-сці іх канцэнтратаў, *агламерату, акатышаў*, флюсавых вапнякоў, *вогнетрывалых матэрыялаў прамысловасць* і інш. Найб. развіта ў Японіі, Кітаі, ЗША, Германіі, Расіі, Украіне і інш.

На Беларусі прамысл. выпуск чыгуну і жалеза пачаўся з канца 18 ст. на з-дах Тызенгаўза ў Брэсцкім пав. Гродзенскай губ., Вішнеўскім і Налібоцкім з-дах у Ашмянскім пав. Віленскай губ., Уладзімірскім з-дзе ў Чэрыкаўскім пав. Магілёўскай губ., якія былі абсталяваны вадзянымі і паравымі рухавікамі і выкарыстоўвалі мясц. балотныя руды і драўняны вугаль. Развіццё ў 2-й пал. 19 ст. Ч.м. на Украіне і ў Расіі на базе мінер. паліва прывяло да спынення металург. вытв-сці на Беларусі. Пачала адраджацца Ч.м. ў 1920-я г., калі ў Магілёве быў пабудаваны трубаліцейны з-д, які з 1937 пачаў выпускаць і ліставую сталь. У 1940 вытв-сць сталі ў рэспубліцы склала 5,2 тыс. т, пракату — 4,1 тыс. т. У 2001 працавала 16 прадпрыемстваў Ч.м. Найбуйнейшае — *Беларускі металургічны завод* у Жлобіне (выпускае трубныя стальныя загатоўкі, буд. арматуру, стальныя катанкі, вугалкі і дрот, швелеры, металакорд; працуе на металаломе і чыгунных чушках). На Магілёўскім металург. з-дзе вырабляюць стальныя і чыгунныя трубы. З-д «Цэнтраліт» (Гомель) спецыялізуецца на вытв-сці адлівак з чыгуну, каналізацыйных люкаў; *Рэчыцкі метызны завод* — дроту, цвікоў; Маладзечанскі з-д лёгкіх метал. канструкцый — стальных труб. Вытв-сць сталі і пракату маецца на буйных маш.-буд. з-дах Мінска, Гомеля, Мазыра, Бабруйска; чыгуннага і стальнога ліцця — на прадпрыемствах Баранавічаў, Бярозы, Навагрудка, Пінска, Полацка і інш. У 1995 выраблена чыг. ліцця 193 тыс. т, сталі 774 тыс. т, гатовага пракату 614 тыс. т, стальных труб 12,3 тыс. т, металакорду 25,6 тыс. т. У 2001 адпаведна 231 тыс. т, 1612 тыс. т, 1475 тыс. т, 42,8 тыс. т, 47,5 тыс. т. Прадукцыя Ч.м. Беларусі экспартуецца ў Расію, ЗША, Германію, Вялікабрытанію, Кітай і інш.

І.І.Рогач.

ЧО́РНАЯ НА́ТАПА, рака ў Мсціслаўскім і Крычаўскім р-нах Магілёўскай вобл., правы прыток р. Сож (бас. р. Дняпро). Даўж. 49 км. Пл. вадазбору 464 км^2. Пачынаецца за 2 км на Пн ад в. Пячкавічы Мсціслаўскага р-на, вусце за 1,5 км на Пд ад в. Сялец Крычаўскага р-на. Цячэ па Горацка-Мсціслаўскай і Аршанска-Магілёўскай раўнінах. Асн. прыток — р. Белая Натапа (злева). Рэчышча на працягу 7 км паміж вёскамі Бялынец і Сычоўка Мсціслаўскага р-на і ніжэй в. Кашаны Крычаўскага р-на (2,4 км) каналізаванае.

ЧО́РНАЯ НО́ЖКА, хвароба раслін, якая выклікаецца паразітычнымі, паўпаразітычнымі грыбамі з родаў альпідый, пітый, *рызактонія* і фітапатаген-

Чорная ножка: 1 — расады капусты; 2 — бульбы.

1 2

нымі бактэрыямі з роду эрвінія. Пашкоджвае ўсходы буракоў, памідораў, морквы, агуркоў, пшаніцы, капусты, турнэпсу, радыскі, рэпы, сеянцы пладовых і лясных культур, сцёблы і клубні (пры захоўванні) бульбы. Каранёвая шыйка і ніжняя ч. сцябла ў раслін чарнее (адсюль назва), патанчаецца і гніе; хворыя расліны вянуць, жаўцеюць, палягаюць, часта гінуць. Крыніца інфекцыі — глеба, заражанае насенне, расл. рэшткі. Развіццю хваробы спрыяюць залішняе ўвільгатненне, шчыльная пасадка, мех. пашкоджанні расады, дрэнная вентыляцыя ў парніках.

ЧО́РНАЯ РА́ДА 1663, сход украінскіх казакоў 27—28.6.1663 на ўскраіне г. Нежын для выбрання гетмана Левабярэжнай Украіны (на Правабярэжнай Украіне гетманам быў выбраны польскі стаўленік П.*Цяцера*). Назва «Ч.р.» ад удзелу ў ёй, акрамя казакоў, «чорных» людзей — сялян і гар. нізоў. Групоўкі казацкай *старшыны* прапаноўвалі на гетманскую пасаду нежынскага палк. В.Залатарэнку і наказнога (часовага) гетмана Я.Самка, але большасць рады выбрала гетманам кашавога атамана Запарожскай Сечы І.*Брухавецкага*, які абяцаў народу знізіць паборы і абмежаваць феад. прыгнёт.

ЧО́РНАЯ РУСЬ, назва паўн.-зах. часткі Беларусі, якая ўвайшла ў склад ВКЛ на пач. этапе яго фарміравання (сярэдзіна 13 ст.). Паводле гіст.-геагр. уяўленняў 18—20 ст., гал. цэнтрамі Ч.Р. былі Навагрудак, Гродна, Ваўкавыск, Слонім. Аднак аўтэнтычныя гіст. крыніцы не пацвярджаюць існавання на гэтай тэрыторыі вобласці з такой назвай. Тэрмін «Ч.Р.», напэўна, быў утвораны на ўзор і ў процівагу *Белай Русі* не раней за 14 ст. ў зах.-еўрап. л-ры і на пачатку не меў трывалай лакалізацыі. У абсалютнай большасці выпадкаў 14—17 ст. назва ўжывалася зах. еўрапейцамі ў дачыненні да розных тэрыторый на У і Пд ад сучаснай Беларусі. Адна з першых крыніц, дзе ўпамінаюцца «чорныя русіны», — нямецкамоўная хроніка Венгрыі Г.Мюгельна (каля 1360), у якой паведамляецца пра перасяленне стараж. венграў у Панонію праз тэр. сучаснай Украіны. На карце Фра Маўра (1459) Ч.Р. пазначана на правабярэжжы Акі. Англ. дыпламат Дж.Флетчэр адзначаў (1591), што Чорнай Сарматыяй (Руссю) называліся Уладзімірскае, Маскоўскае, Разанскае і інш. княствы на Пн ад Чорнага мора. У «Геаграфічным лексіконе» базыльяніна І.Карпінскага (Вільня, 1766) суадносіны паміж 3 «каляровымі» часткамі Русі маюць такі выгляд: Белая Русь — Мсціслаўскае, Віцебскае, Полацкае, Смаленскае ваяв.; Чорная — Навагрудскае і Мінскае ваяв.; Чырвоная — усе ўкр. землі Польшчы. Такі падзел тады лічылі спрадвечным, спрабуючы рэтраспектыўна аднесці яго як мінімум да 14 ст. У сапраўднасці чляненне Русі на Белую, Чорную і Чырвоную штучнае і не было ўласцівае самім усх. славянам, пакуль да іх у 16—17 ст. шырока не пранікла еўрап. адукаванасць.

Літ.: Белы А. Хроніка «Белай Русі» = Chronicon «Russiae Albae»: Нарыс гісторыі адной геагр. назвы. Мн., 2000. *А.В.Белы.*

ЧО́РНАЯ У́РАДА. Возера ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дзіва, за 1 км на У ад в. Вялічкаўцы, за 22 км на ПдУ ад г.п. Ушачы. Уваходзіць ва *Ушацкую групу азёр*. Пл. 0,53 км^2, даўж. 1,6 км, найб. шыр. 430 м, найб. глыб. 3,9 м, даўж. берагавой лініі 4,3 км. Пл. вадазбору 93,7 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу, выцягнутая з Пн на Пд, яе схілы выш. 5—8 м, спадзістыя, пераважна разараныя, на Пн і Пд месцамі забалочаныя. Берагі нізкія, спадзістыя, пясчаныя або забалочаныя, на Пд сплавіна шыр. 10—15 м. Дно сапрапелістае, на мелкаводдзі месцамі зайленыя пяскі. Моцна зарастае. Упадаюць ручай Пракса і р. Бельская, злучана ручаём з воз. Атолава.

ЧО́РНЕНСКАЯ ПАРКЕ́ТНАЯ ФА́БРЫКА. Дзейнічала ў 1878—81 у в. Чорнае (цяпер у Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл.). Выпускала паркет масіўны (таўшчыня 1,5 цалі) і звычайны (0,5 цалі). У якасці сыравіны выкарыстоўвалі хвою, дуб, клён, граб, чырв. дрэва. Мела паравы рухавік. За год вырабляла да 3750 квадратных сажняў паркету. У 1879—81 працавала 80 чал. На выстаўках у Парыжы (1878) вырабы ф-кі адзначаны сярэбраным медалём, на Усерас. прамысл.-маст. у Маскве (1882) — бронз. медалём.

ЧО́РНЫ Гарымір Гарыміравіч (н. 22.1.1923, г. Камянец-Падольскі Хмяльніцкай вобл., Украіна), расійскі вучоны ў галіне механікі. Акад. Рас. АН (1981, чл.-кар. 1962). Скончыў Маскоўскі ун-т (1949). У 1949—57 у Цэнтр. ін-це авіяц. маторабудавання. З 1959 у НДІ механікі Маскоўскага ун-та (з 1960 дырэктар). Навук. працы па тэарэт. і прыкладной аэрадынаміцы вял. скарасцей, тэорыі дэтанацыі і гарэння. Развіў тэорыю пагранічнага слоя з паверхняй разрыву ўнутры яго, прапанаваў метад інтэгравання ўраўненняў газавай дынамікі для патокаў з моцнымі ўдарнымі хвалямі. Распрацаваў метады разліку патокаў газу ў каналах пры наяўнасці франтоў гарэння. Дзярж. прэміі СССР 1972, 1978.

Тв.: Течение газа с большой сверхзвуковой скоростью. М., 1959; Теория сверхзвуковых течений газа // Механика в СССР за 50 лет. М., 1970. Т. 2; Теоретическое и экспериментальное исследование аэродинамических характеристик пространственных тел. М., 1979.

ЧО́РНЫ Кузьма (сапр. Раманоўскі Мікалай Карлавіч; 24.6.1900, в. Жабчава Капыльскага р-на Мінскай вобл. — 22.11.1944), бел. пісьменнік. Вучыўся ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі (1916—19), БДУ (1923—25). У 1920—22 сакратар валаснога рэўкома, настаўнік у в. Цімкавічы (Капыльскі р-н), справавод Слуцкага пав. ваенкамата. У 1924—28 у газ. «Беларуская вёска». Чл. літ. аб'яднання «Маладняк» (1923—26), старшыня літ. аб'яднання «Узвышша» (1926—31), гал. рэдактар час. «Узвышша» (1927—31). У 1934—38 заг. кабінета маладога аўтара пры Саюзе пісьменнікаў Беларусі. 14.10.1938 беспадстаўна арыштаваны, 8.6.1939 вызвалены з астрогу. З 1941 у эвакуацыі ў Маскве, удзельнічаў у выданні газеты-

Г.Г.Чорны.

К.Чорны.

плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». Летам 1944 вярнуўся ў Мінск, працаваў у час. «Беларусь». Друкаваўся з 1920 як паэт (пад уласным прозвішчам і крыптанімам М.Р.). З 1921 выступаў як празаік. Першыя зб-кі апавяданняў «Апавяданні», «Срэбра жыцця» (абодва 1925). У «маладнякоўскі» перыяд творчасці пераважалі паэт. замалёўкі, эцюды, імпрэсіі, у якіх апяваецца харство бел. прыроды, услаўляецца абуджэнне мужыка-беларуса. У апавяданнях «узвышаўскага» перыяду (зб-кі «Па дарозе», «Пачуцці», «Хвоі гавораць», усе 1926; «Вераснёвыя ночы», 1929) — паглыблены псіхал. аналіз, сцвярджэнне гуманіст. думкі пра вял. сілу чалавека на зямлі, стварэнне каларытных вобразаў «палявых людзей», якія ўвасабляюць лепшае ў бел. характары, вобразаў прадстаўнікоў маладога пакалення, схільных да філас. разваг і актыўных грамадскіх учынкаў. У апавяданнях 1930-х г. (зб. «Брыгадзіравы апавяданні», 1932) спроба авалодаць вытв. тэмай, паказаць працэс нараджэння калектывіста, ударніка сацыяліст. працы, выявіць у ім прыкметы класавай прыналежнасці, што вяло да схематызму і збедненасці вобразаў. У апавяданнях 1940-х г. (зб. «Вялікае сэрца», 1945) узнаўленне драм. эпізодаў перыяду Вял. Айч. вайны, малюнкаў спусташэння бел. зямлі, волі беларусаў да супраціўлення. У рамане «Сястра» (1927—28) вострае драм. сутыкненне супрацьлеглых поглядаў на ролю асобы ў працэсе рэв. абнаўлення свету, адмаўленне непаважлівага стаўлення да чалавека, сцвярджэнне хрысц. каштоўнасцей. У рамане-паэме «Зямля» (1928) пераважае паказ «плыні свядомасці» герояў з простанароддзя, харства простых людзей, бел. нар. звычаяў і прыроды. У аповесці «Лявон Бушмар» (1929) класічны тып чалавека-ўласніка, вобразам якога сцвярджаецца роля псіхал. і біял.

спадчыннасці ў станаўленні асобы. У незавершаных раманах «Вецер і пыл» (1927—29), «Ідзі, ідзі» (1930) праз шэраг яркіх вобразаў і псіхал. тыпаў зроблена спроба ўзнавіць драм. атмасферу ідэалаг. спрэчак пра шляхі абнаўлення свету перыяду рэвалюцыі, грамадз. вайны, калектывізацыі і індустрыялізацыі краіны. У пач. 1930-х г. Ч. прыйшоў да задумы напісаць «у мастацкіх вобразах гісторыю беларускага народа ад знішчэння паншчыны і да нашых дзён»: раманы «Бацькаўшчына» (1931), «Трыццаць год» (няскончаны, 1934), «Трэцяе пакаленне» (1935), аповесць «Люба Лук'янская» (1936). Рукапісы раманаў «Простыя людзі», «Вялікае выгнанне», «Судны дзень» згарэлі ў першыя дні Вял. Айч. вайны. У рамане «Бацькаўшчына» — праблема Радзімы, якая на працягу стагоддзяў хвалявала беларусаў. У «Трэцім пакаленні» Ч. цікавіць паняцце ўласнасці, яго ўплыў на характар і лёс чалавека. У аповесці «Люба Лук'янская» — паэтызацыя духоўнага хараства бел. жанчыны, драматызм яе жыцця ў «эпоху войнаў і рэвалюцый». Задуманы Ч. празаічны цыкл развіты ў раманах «Пошукі будучыні» (нап. 1943, апубл. 1950), «Вялікі дзень» (нап. 1941—44, няскончаны, апубл. 1947), «Млечны Шлях» (нап. 1944, апубл. 1954), незавершаных эпічных творах «Скіп'еўскі лес» (1944, апубл. 1946), «Сумліцкая хроніка» (нап. 1941—44, апубл. 1975), «Смага» (нап. 1944, апубл. 1975) і інш., у якіх паказаны лёс беларусаў у час вял. выпрабаванняў, адносіны герояў да зямлі, уласнасці, бацькаўшчыны, маралі, будучыні і інш. Аўтар п'ес «Бацькаўшчына» (на аснове аднайм. рамана, паст. 1932, БДТ-1; 1966, Бел. т-р імя Я.Коласа), «Ірынка» (паст. 1941, БДТ-1 і БДТ-2), аповесці для дзяцей «Насцечка» (1940) і інш. Пераклаў на бел. мову аповесці «Станцыйны даглядчык», «Трунар», «Дуброўскі», «Капітанская дачка» А.Пушкіна, п'есы «Рэвізор» М.Гогаля, «Гарачае сэрца» і «Позняе каханне» А.Астроўскага, «Апошнія» і «Варвары» М.Горкага і інш. Асобныя творы Ч. інсцэнізаваны і экранізаваны: інсцэніроўка «Уласнасць» А.Гутковіча і Ф.Казлоўскай паводле рамана «Трэцяе пакаленне» (1959), спектакль «Вялікае сэрца» (паст. 1960, Бел. тэлебачанне; паводле аднайм. рамана), фільм «Ноч пры дарозе» (1992, паводле аднайм. апавядання).

Тв.: Зб. тв. Т. 1—8. Мн., 1972—75; Выбр. творы. Мн., 2000.

Літ.: Кузьма Чорны: Зб. матэрыялаў аб жыцці і творчай дзейнасці пісьменніка. Мн., 1959; Адамовіч А. Маштабнасць прозы: Урокі творчасці Кузьмы Чорнага. Мн., 1972; Пяткевіч А. Сюжэт. Кампазіцыя. Характар: Аб прозе Кузьмы Чорнага. Мн., 1981; Тычына М.А. Кузьма Чорны // Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. Мн., 1999. Т. 2.

М.А.Тычына.

ЧО́РНЫ Саша (сапр. Глікберг Аляксандр Міхайлавіч; 13.10.1880, г. Адэса, Украіна — 5.8.1932), рускі паэт. З 1905 супрацоўнічаў у пецярбургскіх сатыр. часопісах, у т.л. ў 1908—11 у час. «Сатирикон». З 1920 у эміграцыі. Друкаваўся з 1904. У сатыр. вершах (зб-кі «Сатыры», 1910; «Сатыры і лірыка», 1911) стварыў іранічную маску апалітычнага інтэлігентнага абывацеля, водгук на многія злабадзённыя тэмы. У кн. вершаў «Смага» (1923) пачуццё тугі па страчанай Радзіме. Кн. «Несур'ёзныя апавяданні» (1928) пра жыццё і побыт суайчыннікаў за мяжой. Аўтар кн. прозы «Салдацкія казкі» (апубл. 1933), твораў для дзяцей («Дзённік фокса Мікі», 1927; п'еса «Вяртанне Рабінзона», 1922), вершаў, апавяданняў. Творам уласцівы арганічны сінтэз сатыры і лірыкі, рэзкі стыль, наўмысны антыэстэтызм. Цыкл муз. твораў на яго словы стварыў Дз.Шастаковіч.

Тв.: Избр. проза. М., 1991; Дневник фокса Микки. Мн., 1998; Лирика. Мн., 2002.

ЧО́РНЫ БОР, вёска ў Быхаўскім р-не Магілёўскай вобл., на аўтадарозе Магілёў—Бабруйск. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 28 км на ПнЗ ад г. Быхаў, 37 км ад Магілёва, 22 км ад чыг. ст. Семуковічы. 319 ж., 139 двароў (2003). Сярэдняя школа-сад, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі.

«ЧО́РНЫ БОР», каменны *метэарыт*, які ўпаў у 1965 (паводле некаторых крыніц у 1936) каля в. *Чорны Бор* Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. Знойдзены 2 кавалкі па 4 кг кожны. Належыць да хандрытаў. 2 абломкі ў калекцыі метэарытаў Рас. АН, 1 зберагаецца ў Магілёўскім абл. краязнаўчым музеі.

ЧО́РНЫ ПАПА́Р, гл. ў арт. *Папар*.

«ЧО́РНЫ ПЕРАДЗЕ́Л», Партыя сацыялістаў-федэралістаў, рэвалюцыйная народніцкая арг-цыя ў Расіі ў 1879—82. Узнікла ў выніку распаду *«Зямлі і волі»*. Стваральнікі і кіраўнікі: Г.В.*Пляханаў*, М.Р.Папоў, В.І.*Засуліч*, В.В.Аптэкман, Я.В.Стафановіч, Л.Р.Дэйч, П.Б.Аксельрод, А.П.Буланаў, В.М.Ігнатаў і інш. «Ч.п.» адмаўляў прынцып цэнтралізму і складаўся з незалежных гурткоў у Пецярбургу, Маскве, Харкаве, Мінску, Казані, Адэсе, Кіеве, Пермі і інш. Ролю цэнтра адыгрывала найб. моцная Пецярб. арг-цыя (яе членам быў А.В.*Бонч-Асмалоўскі*). Ідэйную платформу напачатку вызначалі праграма і тактыка «Зямлі і волі», яе дэвіз — «усё для народа, усё сіламі народа». Задачы арг-цыі: падрыхтоўка нар. рэвалюцыі шляхам прапаганды сацыяліст. ідэй і разгортвання эканам. барацьбы, каб змяніць дзярж. лад Расіі, перадаць зямлю сялянам на аснове ўраўняльнага падзелу («чорнага перадзелу»), фабрыкі і заводы — рабочым; пераход да сацыялізму («поўнага калектывізму»). «Ч.п.» адмоўна ставіўся да паліт. барацьбы, у пач. 1880 прызнаў мэтазгоднасць паліт. тэрору як сродку барацьбы супраць самадзяржаўя, аднак не лічыў яго першачарговай задачай. Прапагандаваў федэратыўны прынцып паліт. арг-цыі народа, выступаў за аўтаномію нац. раёнаў, у т.л. Беларусі. Гал. рухальнай сілай рэвалюцыі лічыў сялянства, але працаваў пераважна сярод рабочых, студэнтаў, навучэнцаў і вайскоўцаў. Друкаваныя выданні: газ. «Черный передел» і «Зерно». Крызіс народніцкай ідэалогіі, паліцэйскія праследаванні прывялі «Ч.п.» да распаду. Частка яго членаў (Пляханаў, Засуліч, Дэйч і інш.) перайшла на пазіцыі марксізму (гл. *«Вызваленне працы»*).

На Беларусі групы чорнапередзельцаў склаліся ў Мінску (Л.М.Насовіч, К.В. і Р.В. Парфіяновічы, С.Ляўкоў, І.Гецаў, С.Грынфест) і Гродне (М.Янчэўскі, Я.Грынкевіч, І.А.*Гурвіч* і інш.). Яны вялі прапаганду сярод насельніцтва, памагалі вызваляць паліт. вязняў, забяспечвалі дакументамі і перапраўлялі праз граніцу рэвалюцыянераў. У мінскай друкарні «Ч.п.» ў 1881 надрукаваны № 3—5 газ. «Черный передел», № 3—6 газ. «Зерно» і 5 пракламацый. У 1882 мясц. групы «Ч.п.» распаліся. *М.В.Біч.*

ЧО́РНЫ ПО́РАХ, тое, што *дымны порах*.

ЧО́РНЫЯ ГО́РЫ, горны масіў ва Украінскіх Карпатах; тое, што *Чарнагора*.

ЧО́РНЫЯ ДЗІ́РЫ, шчыльныя кампактныя касмічныя аб'екты, сціснутыя ў ходзе *гравітацыйнага калапсу* да памераў, меншых за радыус r_h сферы (гарызонту падзей), з-пад якой з-за гіганцкага поля прыцягнення не могуць выходзіць ні часціцы, ні выпрамяненне. Прадказанне аб існаванні Ч.дз. і апісанне іх уласцівасцей грунтуюцца на вывадах агульнай *адноснасці тэорыі* (АТА).

Паводле АТА значэнне r_h вызначаецца масай, эл. зарадам і вуглавым момантам калапсуючага аб'екта; для сферычнай невярчальнай Ч.дз. r_h роўнае яе *гравітацыйнаму радыусу*. З прычыны нябачнасці Ч.дз. адзіным яе праяўленнем з'яўляецца гравітацыйнае поле. Таму масу і наяўнасць гарызонту падзей вызначаюць па руху газавага асяроддзя ці зорак у наваколлі Ч.дз. Сучаснымі метадамі назірання выяўлена каля 100 кандыдатаў у Ч.дз.

Літ.: Хокинг С. Черные дыры и молодые вселенные: Пер. с англ. СПб., 2001; Че-

Пылавы дыск вакол **чорнай дзіры** ў цэнтры галактыкі NGC 4261 (касмічны тэлескоп імя Э.Хабла, 1995, НАСА).

р е п а щ у к А.М. Поиски черных дыр: новейшие данные // Успехи физ. наук. 2001. Т. 171, № 8. *М.М.Касцюковіч.*

ЧО́РНЫЯ ЗЕ́МЛІ, зямельныя ўладанні *чарнасошных сялян* і цяглага гар. насельніцтва Расіі 14—17 ст. З пач. 18 ст. наз. «казённымі» (дзяржаўнымі) землямі.

«ЧО́РНЫЯ КО́ДЭКСЫ» (Black Codes), дыскрымінацыйныя заканадаўчыя акты, прынятыя ў шэрагу паўд. штатаў ЗША пасля *Грамадзянскай вайны ў ЗША 1861—65* для захавання нераўнапраўя афраамерыканцаў. Іх прымушалі працаваць за мізэрную плату ў б. гаспадароў, пазбаўлялі свабоды перамяшчэння, права на валоданне зямлёй ці арэнду, забаранялі мець зброю, браць шлюб з белымі. У 1870-я г. ў шэрагу штатаў «Ч.к.» адменены, аднак некат. іх артыкулы захаваліся ў канстытуцыях і крымінальным заканадаўстве паўд. штатаў.

ЧОРТ, вобраз у старадаўніх павер'ях беларусаў і інш. народаў; увасабляў адмоўныя, варожыя чалавеку сілы. Ч. ўяўлялі істотай, пакрытай поўсцю, з рожкамі, казлінай бародкай, хвастом і капытамі. Лічылі, што ён мог перакінуцца ў чалавека, ката, куль саломы і інш. Паводле нар. павер'яў, Ч. вельмі рухавы, звычайна жыў у балоце, шкодзіў чалавеку ў лесе, на расстайных дарогах, лічыўся вінаўнікам сварак у сям'і і г.д. У 19 — пач. 20 ст. вобраз Ч. паступова зліўся з адпаведным міфалагічным вобразам хрысц. рэлігіі — *д'яблам*. Сустракаецца таксама ў легендах, паданнях, прыказках, прымаўках, легендарных і чарадзейных казках. *М.Ф.Піліпенка.*

ЧО́РТАВА ДРЭ́ВА, гл. ў арт. *Аралія*.

«ЧО́РТАВЫ ПА́ЛЬЦЫ», акамянеласці; гл. ў арт. *Белемніты*.

ЧО́РТАЎ КА́МЕНЬ, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1988). Размешчаны за 1 км на Пд ад в. Ратынцы Валожынскага р-на Мінскай вобл. Валун чырвона-бурага граніту рапаківі з крышталямі ружовага палявога шпату (авоіды 8—12 см). Даўж. 5,4 м, шыр. 4,7 м, выш. 3,4 м, у абводзе 15,5 м, аб'ём 45,8 м^3, маса каля 120 т. Формай нагадвае прас. Прынесены ледавіком 220—150 тыс. г. назад з наваколляў г. Выбарг Ленінградскай вобл. Расіі. З валуном звязана шмат паданняў. *В.Ф.Вінакураў.*

Чортаў камень каля в. Ратынцы Валожынскага раёна Мінскай вобл.

ЧО́РТАЎ КА́МЕНЬ, Кравец камень, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1990). Размешчаны за 500 м на З ад в. Вароніна Сенненскага р-на Віцебскай вобл., у пойме р. Абалянка. Валун буйназярністага ружавата-шэрага граніту рапаківі з уключэннем крышталёў палявога шпату (авоіды ад 2 да 8 см у папярочніку). Даўж. 10,2 м, шыр. 6 м, выш. 2,7 м, у абводзе 26,4 м, аб'ём 60 м^3, маса бачнай ч. каля 150 т. Ч.к. — другі па памерах ледавіковы валун на Беларусі. Формай нагадвае цэглу з акругленымі бакамі — класічны прыклад ледавіковай апрацоўкі. Прынесены ледавіком каля 20—17 тыс. г. назад з ПдЗ Фінляндыі. З валуном звязана шмат паданняў. У старажытнасці меў культавае значэнне. *В.Ф.Вінакураў.*

ЧО́РТАЎ КА́МЕНЬ, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1990). Знаходзіцца за 600 м на З ад в. Забор'е Сенненскага р-на Віцебскай вобл. Валун буйназярністага светла-ружовага граніту рапаківі з уключэннем крышталёў палявога шпату (авоіды 1—8 см). Даўж. 4,7 м, шыр. 3,3 м, выш. 1,8 м, у абводзе 12,7 м, аб'ём 15 м^3, маса бачнай часткі каля 40 т. Прынесены ледавіком 20—17 тыс. г. назад з наваколляў г. Выбарг Ленінградскай вобл. Расіі. З валуном звязана шмат паданняў. *В.Ф.Вінакураў.*

ЧО́РТАЎ КА́МЕНЬ АСТА́ШЫНСКІ, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1997). Знаходзіцца на паўд. ускраіне в. Асташын Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл. Валун ружовага граніту рапаківі з уключэннем крышталёў палявога шпату (авоіды ад 1 да 3 см) і мускавіту. Даўж. 3,6 м, шыр. 2,1 м, выш. 0,9 м, у абводзе 9 м, аб'ём 3,6 м^3, маса каля 10 т. Прынесены ледавіком 220—150 тыс. г. назад з Аландскіх а-воў Балтыйскага мора. Горная парода пры транспарціроўцы знаходзілася ў актыўнай зоне ледавіка, дзе набыла пляскатую, выцягнутую форму, падобную на цэглу. З валуном звязана шмат паданняў. У старажытнасці меў культавае значэнне. *В.Ф.Вінакураў.*

ЧО́РТАЎ КА́МЕНЬ БАГДА́НАЎСКІ, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1992). Знаходзіцца на беразе воз. Багданаўскае ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. Валун дробназярністага ружова-шэрага мігматыту з ружовымі жылкамі (2—5 см) палявога шпату. Даўж. 3,4 м, шыр. 3,1 м, выш. 2,2 м, у абводзе 10,1 м, аб'ём 12,3 м^3, маса 33 т. Прынесены ледавіком каля 20—12 тыс. г. назад са Скандынаўскага п-ва. З валуном звязана шмат паданняў. У старажытнасці меў культавае значэнне. *В.Ф.Вінакураў.*

ЧО́РТАЎ КА́МЕНЬ ВЯЛЕ́ЦКІ, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1996). Знаходзіцца за 1,2 км на ПдЗ ад воз. Вялец і в. Вялец Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. Валун шараватаружовага граніту рапаківі з крышталямі палявога шпату (авоіды 2—9 см). Даўж. 3,6 м, шыр. 1,8 м, выш. над паверхняй 0,8 м, аб'ём 2,8 м^3, маса 14 т. Прынесены ледавіком каля 20—15 тыс. г. назад з Выбаргскага масіву Ленінградскай вобл. Расіі. На паверхні 33 круглыя паўсферычныя лункі (дыяметр 5—6 см, глыб. 3 см) з загладжанымі і адшліфаванымі сценкамі. З валуном звязана шмат паданняў. У старажытнасці меў культавае значэнне. *В.Ф.Вінакураў.*

ЧО́РТАЎ КА́МЕНЬ САБО́ЛКАЎСКІ, З д а н ь к а м е н ь, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1999). Знаходзіцца за 500 м на ПнУ ад в. Саболкі Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. Валун чырвона-бурага граніту рапаківі з крышталямі палявога шпату (авоіды 4—8 см), шэрага кварцу (зярняты 0,3—1 см) і крышталямі біятыту, рагавой падманкі. Даўж. 4 м, шыр. 3,3 м, выш. 1,2 м, у абводзе 11,7 м, аб'ём 8,5 м^3, маса 22,6 т. Прынесены ледавіком каля 20—17 тыс. г. назад з наваколляў г. Выбарг Ленінградскай вобл. Расіі. Частка каменя адколатая ўдарам маланкі. З валуном звязана шмат легенд. У старажытнасці меў культавае значэнне. *В.Ф.Вінакураў.*

ЧО́РТАЎ КА́МЕНЬ ХМЯЛЁЎСКІ, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1997). Знаходзіцца на паўн. ускраіне в. Хмялёўка Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл. Валун сяраднезярністага ружовага граніту з крышталямі палявых шпатаў (гнёзды і таблічкі памерам ад 1 × 1 да 2 × 3 см) і ўключэннем ксеналітаў гнейсападобнай пароды. Даўж. 2,5 м, шыр. 2,1 м, выш. 1,75 м, у абводзе 6,7 м, аб'ём 4,9 м^3, маса каля 13 т. Мае прасападобную форму. Прынесены ледавіком 320—250 тыс. г. назад са Скандынаўскага п-ва. У старажытнасці меў культавае значэнне. *В.Ф.Вінакураў.*

ЧО́РТАЎ КА́МЕНЬ ШКЛЕНІКО́ЎСКІ, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1997). Знаходзіцца за 1 км на Пд ад в. Шкленікова Мядзельскага р-на Мінскай вобл. Валун сяраднезярністага чырвона-бурага граніту з асобнымі крышталямі палявога шпату (таблічкі і авоіды 2—3 см). Даўж. 4,6 м, шыр. 3,7 м, выш. 0,8 м, у абводзе 13,6 м, аб'ём 13,7 м^3, маса больш за 40 т. Прынесены ледавіком каля 20—15 тыс. г. назад са Скандынаўскага п-ва. Меў культавае значэнне для продкаў. *В.Ф.Вінакураў.*

ЧО́РТАЎ СЛЕД ЯКУБЯ́НСКІ, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1992). Знаходзіцца за 1,5 км на ПдЗ ад в. Якубянцы Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. Валун ружовага граніту рапаківі з уключэннем крышталёў палявога шпату (таблічкі 2 × 4 см, часам 6 × 8 см), шаравата-блакітнага кварцу і біятыту.

Прынесены ледавіком 20—18 тыс. г. назад з ПдЗ Фінляндыі. На камені ёсць след, аб паходжанні якога існуюць паданні. У старажытнасці меў культавае значэнне. *В.Ф.Вінакураў.*

ЧОРЧ (Church) Алонза (14.6.1903, Вашынгтон — 11.8.1995), амерыканскі логік і матэматык. З 1939 праф. Прынстанскага, з 1967 Каліфарнійскага ун-таў. З 1936 рэдактар час. «The journal of symbolic logic» («Часопіс сімвалічнай логікі»). У 1935 абгрунтаваў палажэнне пра невырашальнасць «масавай праблемы» ў выпадку, калі не існуе (або не можа быць) *алгарытму* для вырашэння ўсіх адзінкавых праблем, якія ўваходзяць у яе склад. Развіў ідэю аб аддзяленні паняцця функцыі ад паняцця мноства, у 1936 прапанаваў асн. гіпотэзу тэорыі выліч. функцый (т.зв. тэзіс Ч.), паводле якой кожная эфектыўна выліч. функцыя з'яўляецца агульнарэкурсіўнай (вызначанай для ўсіх натуральных значэнняў аргумента). У працы «Уводзіны ў матэматычную логіку» (т. 1, 1956) абгрунтаваў метады матэм. логікі, вызначыў яе першасныя паняцці, сфармуляваў правілы лагічнага аперыравання (*злічэння*) з выказваннямі простымі (гл. *Логіка выказванняў*) і раздзеленымі на суб'ект і прэдыкат (гл. *Логіка прэдыкатаў*). Вызначыў такія катэгорыі, як канстанты і пераменныя функцыі, сімвалы, аператары, квантары, несупярэчлівасць і паўната сістэмы аксіём і інш.; прапанаваў для лагічных мэт ужываць спец. створаную фармалізаваную мову. Яго даследаванні паўплывалі на развіццё матэм., камбінаторнай і мадальнай логікі, тэорыі алгарытмаў, *семантыкі лагічнай*.

Тв.: Рус. пер. — Введение в математическую логику. Т. 1. М., 1960. *С.Ф.Дубянецкі.*

ЧО́СЕР (Chaucer) Джэфры (каля 1340, Лондан — 25.10.1400), англійскі паэт, грамадскі дзеяч; заснавальнік агульнаангл. літ. мовы і рэалізму ў англ. л-ры. Быў прыдворным, чл. парламента, займаў шэраг дзярж. пасад. З дыпламат. місіяй наведаў Францыю, Італію, дзе пазнаёміўся з мастацтвам і л-рай Адраджэння. Пад іх уплывам пераклаў помнік сярэдневяковай франц. л-ры «Раман пра Ружу» (каля 1370), напісаў у рэчышчы куртуазнай л-ры элегію «Кніга герцагіні» (1369—70). Аўтар паэм «Дом славы», «Птушыны парламент», «Траіл і Хрызеіда», «Легенда пра добрых жанчын» (усе нап. паміж 1380—86). Вяршыня яго творчасці — «Кентэрберыйскія апавяданні» (1387—1400, выд. 1478), у якіх стварыў рэаліст. галерэю вобразаў людзей усіх класаў і саслоўяў тагачаснай Англіі.

Дж.Чосер.

Тв.: Рус. пер. — Кентерберийские рассказы. М., 1973.

Літ.: Кашкин И.А. Джефри Чосер // Кашкин И.А. Для читателя-современника. М., 1968; Сапрыкин Ю.М. От Чосера до Шекспира: Этич. и политич. идеи в Англии. М., 1985.

ЧО́СІЧ Добрыца (н. 29.12.1921, Велика-Дрэнава, Сербія), сербскі пісьменнік, грамадскі дзеяч. Акад. Сербскай акадэміі навук і мастацтваў (1982). Скончыў Школу журналістыкі і Вышэйшую паліт. школу. У 2-ю сусв. вайну ўдзельнічаў у югасл. партыз. руху. У 1992—93 прэзідэнт Саюзнай Рэспублікі Югаславіі. Друкуецца з 1943. Вядомасць прынёс першы раман «Сонца далёка» (1951), які ўвасобіў пераадоленне ідэалагізацыі і схематызму, азначыў новыя тэндэнцыі ў развіцці л-р народаў Югаславіі. У творчасці, выяўляючы на кожным этапе наватарскія рысы, сцвердзіўся як раманіст эпічнага складу, здольны глыбока асэнсоўваць і дэміфалагізаваць гісторыю народа і чалавецтва, ствараць універсальныя метафары і тыпы: раманы «Карані» (1954), «Казка» (1966), «Грэшнік» (1984), «Адступнік» (1986), «Вернік» (1990) і гісторыка-панарамныя творы «Падзелы» (1961), «Час смерці» (1975), «Час улады» (1995), «Час ліха» (1996). Аўтар кніг публіцыстыкі і эсэістыкі, у т.л. «Перамены» (1992).

Тв.: Рус. пер. — Солнце далеко. М., 1956. *І.А.Чарота.*

ЧО́ХАЎ, Чэхаў Андрэй (?—паміж 23.1 і 8.12.1629), расійскі ліцейшчык, гарматны і звонавы майстар (паводле некат. звестак, выхадзец з Беларусі). Больш за 60 гадоў працаваў у Маскве на Гарматным двары, дзе стварыў шмат (вядома больш за 20) цяжкіх бронзавых

1

2

3

4

5

Геалагічныя помнікі прыроды: 1 — **Чортаў след Якубянскі** каля в. Якубянцы Браслаўскага раёна; 2 — **Чортаў камень Багданаўскі** каля воз. Багданаўскае ў Браслаўскім раёне; 3 — **Чортаў камень Саболкаўскі** каля в. Саболкі Пастаўскага раёна; 4 — **Чортаў камень Вялецкі** каля в. Вялец Глыбоцкага раёна; 5 — **Чортаў камень** каля в. Вароніна Сенненскага раёна.

гладкаствольных гармат, у т.л. *«Цар-гармату»* (1586). Звычайна кожнай гармаце Ч. даваў назву, напр., «Лісіца» (1575), «Воўк» (1576), «Інрог» (*«Аднарог»*, 1577), «Леў» і «Аспід» (1590), «Цар Ахілес» (1617) і інш., упрыгожваў гарэльефам, багатым арнаментам і надпісамі. Гарматы былі выдатным дасягненнем тагачаснай артыл. тэхнікі, служылі шмат гадоў, некат. з іх выкарыстоўваліся ў Паўн. вайне 1700—21. Захавалася 12 гармат Ч., з іх 7 знаходзяцца ў Ваен.-гіст. музеі артылерыі, інж. войск і войск сувязі ў Пецярбургу, 3 — у Маскоўскім Крамлі, 2 — у Швецыі (у Грыпсхольмскім замку, каля Стакгольма, куды яны трапілі ў выніку Лівонскай вайны 1558—83). Ч. стварaў таксама званы, у т.л. «Рэвут» (1621—22) масай 200 пудоў (каля 32 т) для званіцы «Іван Вялікі». Навучыў свайму майстэрству шматлікіх вучняў.

ЧУ, рака ў Кыргызстане і Казахстане. Даўж. 1186 км, пл. бас. 71,6 тыс. км^2, у т.л. 24,1 тыс. км^2 — вобласць унутр. сцёку ў нізоўі Ч. Утвараецца ад зліцця рэк Джуванарык і Качкор, якія пачынаюцца на схілах хр. Тэрскей-Ала-Тоо і Кіргізскі. Ніжэй сутокаў выходзіць у Ісык-Кульскую катлавіну (у мінулым па Ч. адбываўся сцёк воз. Ісык-Куль), праз Баамскую цясніну прарываецца ў Чуйскую даліну, дзе выкарыстоўваецца для арашэння. У нізоўях перасякае пустыню Муюнкум і губляецца ва ўпадзіне Ашчыколь. Найб. прыток Курагаты (злева). Жыўленне пераважна снегавое. Сярэдні расход вады па выхадзе з гор 130 м^3/с, у ніжнім цячэнні (каля с. Уланбель) — 20,4 м^3/с. На Ч. Арто-Такойскае, Тасуткольскае вадасховішчы і інш. ірыгацыйныя збудаванні; гарады Такмак (Кыргызстан), Чу (Казахстан).

ЧУ (Chu) Стывен (н. 28.2.1948, г. Сент-Луіс, штат Місуры, ЗША), амерыканскі фізік. Чл. Нац. АН ЗША (1993), Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1992). Скончыў Рочэстэрскі (1970) і Каліфарнійскі (1976, г. Берклі) ун-ты. З 1978 у фірме «Бел лабораторыс», з 1987 праф. Станфардскага ун-та. Навук. працы па эксперым. атамнай фізіцы, лазернай фізіцы, квантавай электроніцы, фізіцы палімераў, біяфізіцы. Эксперыментальна даказаў парушэнне цотнасці ў атамных пераходах, чым пацвердзіў адзіную тэорыю электраслабага ўзаемадзеяння (1978). Распрацаваў метады адначасовай візуалізацыі і маніпуліравання адзінкавымі біямалекуламі (1991). Прапанаваў механізм лазернага ахаладжэння атамаў ніжэй за тэарэтычны дапплераўскі ліміт (1998, незалежна ад К.Н.*Каэна-Тануджы*). Нобелеўская прэмія па фізіцы 1997 (з У.Д.*Філіпсам* і Каэнам-Тануджы).

Тв.: Рус. пер. — Лазерный захват нейтральных частиц // В мире науки. 1992. № 4; Управление нейтральными частицами // Успехи физ. наук. 1999. Т. 169, № 3.

М.М.Касцюковіч.

ЧУБА́НАЎ Канстанцін Дзмітрыевіч (н. 18.9.1934, г. Віцебск), бел. вучоны ў галіне экалогіі і лесазнаўства. Д-р біял. н. (1992). Скончыў Бел. лесатэхн. ін-т (1959). З 1964 у Бярэзінскім біясферным запаведніку (з 1968 нам. дырэктара). З 1971 у Цэнтр. бат. садзе Нац. АН Беларусі. Навук. працы па праблемах уздзеяння антрапагенных нагрузак на лясныя экасістэмы, запаведныя тэрыторыі, зялёныя насаджэнні ў гарадскіх умовах; вывучэнні ўплыву асушальнай меліярацыі на лясныя насаджэнні Бел. Палесся.

Тв.: Ландшафтно-экологические исследования Белорусского Полесья. Мн., 1979 (разам з В.Н.Кісялёвым); Природная среда в зонах влияния промышленных центров: Сосновые леса Белоруссии. Мн., 1989 (разам з В.Н.Кісялёвым, А.В.Бойкам); Техногенное загрязнение лесных экосистем Беларуси. Мн., 1995 (у сааўт.).

ЧУБА́ТКА (Corydalis), род кветкавых раслін сям. дымніцавых. Каля 300 відаў. Пашыраны ва ўмераным поясе Паўн. паўшар'я, 1 від — у гарах Усх. Афрыкі.

Чубатка прамежкавая.

На Беларусі 3 віды Ч.: пустая, або цыбульная (C. cava), прамежкавая (C. intermedia; занесена ў Чырв. кнігу) і шчыльная, ці Галера (C. solida). Трапляюцца ў лісцевых і мяшаных лясах, сярод хмызняку, цвітуць рана вясной. У культуры Ч.: буйнакветная (C. gigantea), высакародная (C. nobilis), жоўтая (C. lutea) і інш.

Адна-, радзей двух- і шматгадовыя травяністыя расліны, часта з падземнымі клубнямі. Сцябло простае. Лісце пераважна двойчы-тройчыперыстае, чаргаванае. Кветкі фіялетавыя, жоўтыя ці белаватыя, няправільныя, са шпоркай, сабраныя ў рыхлую гронку. Плод — стручкападобная каробачка. Клубні ядавітыя, маюць алкалоіды, якія выкарыстоўваюцца ў медыцыне. Лек., меданосныя і дэкар. расліны.

ЧУБА́ТКІ (Notodontidae), сямейства начных матылёў. Больш за 3 тыс. відаў. Пашыраны ў лясах умеранага і трапічнага паясоў. На Беларусі 27 відаў. Найб. тыповыя: лунка серабрыстая (Phalera bucephala), Ч. альховая (Notodonta dromedarius), Ч. зігзаг (N. ziczac), гарпія вялікая (Cerura vinula) і віды роду гроначніц (Pygaera).

Размах крылаў 3—10 см, заднія карацейшыя за пярэднія. На заднім краі пярэдніх крылаў валасісты выраст, падобны да зубца або чубка (адсюль назва). Тулава тоўстае, доўгае, укрытае пушыстымі валаскамі. Афарбоўка шэрая або бураватая, радзей яркая. Вусені рознай формы, голыя, яркія, з вял. плоскай галавой і вырастамі на целе; кормяцца лісцем дрэў і кустоў. 1—2 пакаленні за год. Некат. — шкоднікі лесу.

ЧУБІ́НСКІ Павел Платонавіч (27.1.1839, г. Барыспаль Кіеўскай вобл. — 26.1.1884), украінскі і рускі этнограф і фальклярыст. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1861). За народніцкую прапаганду быў сасланы (1862—69). У 1869—70 узначальваў этнагр. экспедыцыі на Украіну, Беларусь (Мазырскі, Пінскі, Кобрынскі, Слонімскі, Брэсцкі паветы) і Малдавію. У 1873—76 кіраваў Паўд.-Зах. аддзелам Рус. геагр. т-ва. У 1876—79 у Пецярбургу. Аўтар «Нарыса народных юрыдыч-

Чубаткі: 1 — зігзаг; 2 — альховая; 3 — лунка серабрыстая; 4 — гарпія вялікая; 5 — вілахвост букавы (а — вусені).

ных звычаяў і паняццяў у Магарасіі» (1869). У «Працах этнаграфічна-статыстычнай экспедыцыі ў Заходне-Рускі край...» (т. 1—7, 1872—79) фальклор.-этнагр. матэрыялы з Мінскай і Гродзенскай губ. (каля 400 песень, 25 казак, 5 апісанняў вяселляў). *І.У.Саламевіч.*

ЧУ́БРЫКАЎ Леанід Гаўрылавіч (н. 8.9.1926, в. Акунева Прамышленнаўскага р-на Кемераўскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне электронікі. Д-р тэхн. н. (1992), праф. (1994). Скончыў Свярдлоўскі політэхн. ін-т (1958). З 1958 ва Уральскім філіяле АН СССР, Жданаўскім металургічным ін-це. У 1973—75 і з 1978 у Гомельскім політэхн. ін-це. У 1975—77 ва Усесаюзным НДІ методыкі і тэхнікі разведкі (г. Рэчыца). З 1998 у Гомельскім тэхн. ун-це. Навук. працы па скарасной фільтрацыі сігналаў, тэарэт. біялогіі і анкалогіі.

Тв.: Сущность жизни. Гомель, 1995; Скоростные фильтры сигналов. Гомель, 2000; Основы промышленной электроники. Гомель, 2003.

ЧУБУ́К, млекакормячае сям. пустарогіх; гл. *Снежны баран.*

ЧУБУКО́Ў Сямён Ісакавіч (7.1.1907, в. Кузьмінічы Чавускага р-на Магілёўскай вобл. — 30.6.1983), Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з 1929. Скончыў

С.Чу.

С.І.Чубукоў.

курсы мал. лейтэнантаў (1939), «Выстрал» (1940) і ўдасканалення афіцэрскага саставу (1944), Вышэйшую афіцэрскую школу бранятанк. і механіз. войск (1948). У Вял. Айч. вайну з мая 1942 на Зах., Цэнтр., 1-м Прыбалт. франтах; удзельнік баёў пад Масквой, вызвалення Беларусі. Батальён на чале з маёрам Ч. вызначыўся ў Курскай бітве: 12.7.1943 фарсіраваў р. Выцебець, вызваліў райцэнтр с. Ульянава і інш. нас. пункты Калужскай вобл.; паранены Ч. не пакінуў поля бою. Да 1954 у Сав. Арміі.

ЧУБУ́Т (Chubut), рака на Пд Аргенціны. Даўж. 810 км, пл. бас. каля 138 тыс. км^2. Вытокі ў Патагонскіх Андах, перасякае паўпустынныя вобласці Патагоніі ў вузкай глыбокай даліне, упадае ў Атлантычны ак. каля г. Росан. Гал. прыток — р. Рыо-Чыка (справа). Сярэдні расход вады каля 50 м^3/с. У нізоўях ГЭС.

ЧУВА́ШСКАЯ МО́ВА, адна з *цюркскіх моў*. Пашырана ў *Чувашыі*, а таксама ва Ульянаўскай, Пензенскай, Куйбышаўскай, Саратаўскай, Арэнбургскай абласцях, Татарстане, Башкортастане. Мае 2 дыялекты: «укаючы» і «окаючы», у якіх вылучаюць шэраг гаворак. Ч.м. ўласцівы: у фанетыцы — ратацызм (замена гукаў s, z у інтэрвакальным становішчы на r), ламбдаізм (замена гука š на l); у марфалогіі — выкарыстанне марфемы множнага ліку «-сем» замест агульнацюрк. «-лар», наяўнасць поўных і кароткіх форм лічэбнікаў, супадзенне канчаткаў давальнага і вінавальнага склонаў, своеасаблівая сістэма ўказальных займеннікаў; у лексіцы — вял. колькасць запазычанняў са стараж.-цюрк. моў, а таксама з манг., фіна-угорскіх, іранскіх, араб. і рус. моў. Літ. мова на аснове «ўкаючага» дыялекту. Першая граматыка Ч.м. выдадзена ў 1769. Пісьменства з 1870-х г. Апошняя рэдакцыя алфавіта на аснове рус. графікі з 1938.

Літ.: Андреев И.А. Чувашский язык // Языки народов СССР. М., 1966. Т. 2.

Л.Я.Міхневіч.

ЧУВАШЫ́ (саманазва ч а в а щ), народ, асноўнае насельніцтва *Чувашыі* (907 тыс. чал.). Жывуць таксама ў інш. рэгіёнах Расіі (пераважна ў Паволжы і на Урале) і краінах СНД. Усяго ў Рас. Федэрацыі 1773,6 тыс. чал. (1989). Гавораць на *чувашскай мове*. Вернікі пераважна праваслаўныя.

ЧУВА́ШЫЯ, Чувашская Рэспубліка. Размешчана на У еўрап. ч. Рас. Федэрацыі, у сярэднім цячэнні р. Волга. Пл. 18,3 тыс. км^2. Нас. 1353, 4 тыс. чал. (2001), гарадскога 61%. Сярэдняя шчыльнасць 74 чал. на 1 км^2. Жывуць чувашы (67,8%), рускія (26,7%), татары (2,7%), мардва (1,4%) і інш. Сталіца — г. *Чэбаксары*. Найб. гарады: Новачэбаксарск, Канаш, Алатыр, Шумерля.

Прырода. Тэр. Ч. пераважна раўнінная. Правабярэжжа Волгі — паўн. ч. Прыволжскага ўзв. з Чувашскім плато (выш. да 266 м); левабярэжжа (Заволжа) — нізінная раўніна. Карысныя выкапні: гаручыя сланцы, фасфарыты, торф, буд. матэрыялы. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. -13 °С, ліп. 18,6 °С. Ападкаў 450—500 мм за год. Гал. рака — Волга з прытокамі Сура, Цывіль. Чэбаксарскае вадасховішча. Глебы пераважна дзярнова-падзолістыя і шэрыя лясныя, на Пд — выщчалачаныя чарназёмы. Пад лесам каля 1/3 тэр. (хвоя, елка, бяроза, вольха, дуб, ліпа), на Пд — лесастэп. З жывёл у лясах пашыраны воўк, ліс, зайцы русак і бяляк, лось, барсук, куніца, бабёр, выдра, дзік, мядзведзь; з птушак — цецярук, курапатка, глушэц, качкі, слонка, каршун. Нац. парк Чаваш Вармане, Прысурскі запаведнік.

Гісторыя. Тэр. Ч. заселена ў палеаліце. У 1 тыс. н.э. тут жылі угра-фін. плямёны. Цюркамоўныя продкі *чувашоў* — качавыя булгарасуварскія плямёны разам з гуннамі прыйшлі з Цэнтр. Азіі і ў 7 ст. ўтварылі на тэр. ад Прыаралля да Паўн. Каўказа вял.-плем. аб'яднанне «Вял. Булгарыя». Пад націскам хазараў ч. булгара-суваравў (племянны цэнтр — Сувар) перасялілася ў Сярэдняе Паволжа, дзе ў працэсе асіміляцыі насельніцтва угра-фін. земляробчых абшчын паступова пераходзіла да аселага жыцця. У 10 ст. яны стварылі дзяржаву *Балгарыя Волжска-Камская*, дзе пануючай рэлігіяй стаў іслам. Частка булгара-суваравў адмовілася яго прыняць і на чале са сваім правадыром Вырогам перасялілася на тэр. сучаснай Ч., дзе ў выніку асіміляцыі з угра-фінамі ў канцы 15 ст. ў асн. сфарміравалася чув. народнасць. З канца 1230-х г. тэр. Ч. пад уладай *Залатой Арды*, з 1438 — *Казанскага ханства*. Чувашы мелі сваіх плем. князёў, спавядалі эти. язычніцкую рэлігію з элементамі зараастрызму, іудаізму і ісламу. У 1551 яны добраахвотна далучыліся да Рас. дзяржавы, якой у 16 — пач. 18 ст. плацілі *ясак*, потым пераведзены ў казённых сялян. Былі засн. гарады Алатыр (1552), Чэбаксары (1555), Цывільск (1584), Ядрын (1590). З 1708 Ч. (Алатырскі, Чэбаксарскі, Курмышскі, Цывільскі, Ядрынскі пав.) у складзе Казанскай і Ніжагародскай, з 1775—96 — Казанскай і Сімбірскай губ. У 18—19 ст. б.ч. чувашоў прымусова хрысціянізавана, частка этнаграф. групы чувашоў — анатры — хрысціянства не прыняла і захавала традыцыйныя вераванні. У сярэдзіне 19 ст. зарадзілася нац. л-ра, чув. пісьменнасць з 1870-х г. развівалася на аснове рус. алфавіта. У 1913 налічваліся 463 чув. школы і вучылішчы. Сав. ўлада ўстаноўлена ў ліст. 1917 — маі 1918.

Беларусі было эвакуіравана каля 70 тыс. чал. У пасляваен. час у Ч. створана развітая прам-сць, развівалася нац. культура. У вер. 1990 Вярх. Савет Чув. АССР прыняў дэкларацыю аб дзярж. суверэнітэце рэспублікі і ўвёў яе сучасную назву. У 1993 уведзена пасада прэзідэнта (са студз. 1994 М.В.Фёдараў).

Гаспадарка. Ч. — індустр.-агр. рэгіён Расіі. У структуры валавога рэгіянальнага прадукту прам-сць і буд-ва складаюць 38,5%, сельская гаспадарка — 18,5%, сфера паслуг — 43%. Асн. галіны прам-сці (паводле кошту прамысл. прадукцыі, 1999): машынабудаванне і металаапрацоўка (43,4%), электраэнергетыка (12,6%), хім. (10,2%), харч. (14,5%), лёгкая (7,6%), вытв-сць буд. матэрыялаў (4,7%), лясная і дрэваапр. (2,4%). У 2000 дзейнічала 1126 прадпрыемстваў, у т.л. 410 буйных і сярэдніх. Маш.-буд. прадпрыемствы вырабляюць магутныя трактары (260 шт., 2000), бульдозеры (250 шт.), трубаўкладчыкі, дызелі для суднаў, аўтафургоны, буравыя ўстаноўкі, электрастанцыі для пасёлкаў, ткацкія станкі, хмелеўборачныя машыны, бульбакапалкі, электроніку для авіяцыі, быт. тэхніку. Асн. цэнтры: Чэбаксары, Алатыр, Шумерля, Канаш, Марыінскі Пасад. Выпрацоўка электраэнергіі 4,3 млрд. кВт·гадз (2000) пераважна на ЦЭЦ (Чэбаксарская 1 і 2, Новачэбаксарская і інш.) і Чэбаксарская ГЭС (на р. Волга). Каля 1 млрд. кВт·гадз электраэнергіі экспартуецца ў суседнія рэгіёны Расіі. Хім. прам-сць спецыялізуецца на вытв-сці больш як 200 відаў прадукцыі — хімікаты для здабычы нафты, ядахімікаты, лакі, фарбы і інш. (Канаш, Чэбаксары). Развіта харч. (мясная, малочная, кандытарская, кансервавая, лікёра-гарэлачная, піваварная) прам-сць. Вытв-сць мяса — 9,2 тыс. т, малака — 63,5 тыс. т, кандытарскіх вырабаў — 14 тыс. т, лікёра-гарэлачных вырабаў — 1,1 млн. дэкалітраў, піва — 3 млн. дэкалітраў, крухмалу — 723 т штогод. Лёгкая (баваўняная, трыкат., швейная, абутковая, дывановая, вытв-сць маст. вырабаў), лясная і дрэваапр., у т.л. мэблевая прам-сць. Вытв-сць буд. матэрыялаў. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі і вытв-сці збожжа. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 1 млн. га. Пасяўная пл. 693,1 тыс. га (2000), у т.л. пад збожжавымі культурамі 43,2%, тэхн. 0,7%, бульбай і агародніна 11,2%, кармавымі 44,9%. Асн. збожжавыя культуры: пшаніца, жыта, ячмень, авёс, грэчка; вырошчваюць хмель (80% вытв-сці Расіі, 10-е месца ў свеце), цукр. буракі, сланечнік, каноплі. Бульбаводства, агародніцтва. Збор (тыс. т, 2000) збожжа 508,8, бульбы 596,5, агародніны 197,1. Пагалоўе (тыс. галоў, 2000) буйн. раг. жывёлы 328, свіней 215,8. Авечкагадоўля. Птушкагадоўля. Пчалярства. Даўж. чыгунак 396 км, аўтадарог з цвёрдым пакрыццём 4474 км (2000). Буйны чыг. вузел Канаш. Суднаходства па рэках Волга і Сура. Парты: Чэбаксары і Новачэбаксарск. Аэрапорты ў гарадах Чэбаксары, Новачэбаксарск, Алатыр. Нафта- і газаправоды з Зах. Сібіры і Сярэдняга Паволжа ў Цэнтр. і Паўн.-Зах. раёны.

Культура. Да 10—12 ст. адносяцца паселішчы волжскіх балгар (замак у в. Цігашава). У 2-й пал. 16—17 ст. былыя рус. крэпасці (Алатыр, Чэбаксары і інш.) ператварыліся ў гарады з каменнымі жылымі будынкамі, саборамі (5-купальны Увядзенскі сабор у Чэбаксарах), драўлянымі цэрквамі (Казанская царква ў с. Белаволжскае, усе 17 ст.). Для нар. жылля характэрна глухая, рэльефная, накладная, ажурная разьба, што аздабляла карнізы, аканіцы і ліштвы, слупы варот. У 18 ст. архітэктура развівалася пад уплывам барока: жылыя дамы, Успенская царква ў Чэбаксарах, дом ігуменні манастыра ў г. Цывільск. З рысамі класіцызму пабудаваны цэрквы Узнясенская ў с. Сямёнаўскае, Троіцкая ў г. Ядрын, Крыжаўзвіжанская ў Алатыры і інш. З чувашоў паходзіць рас. архітэктар і жывапісец 18 ст. П.Ягораў. Сярод будынкаў 20 ст.: у Чэбаксарах — Дом Саветаў (1940), палацы культуры «Электрык» (1964) і з-да прамысл. трактароў (1992), музеі В.І.Чапаева (1974) і маст. (1985). Сярод пачынальнікаў выяўл. мастацтва жывапісцы М.Спірыдонаў, М.Свярчкоў, Ю.Зайцаў, А.Кокель, скульпт. Р.Спірыдонаў і інш. У пасляваен. гады вядучае месца належала жывапісу (М.Аўчыннікаў, Ф.Осіпаў, П.Грыгор'еў-Савушкін, А.Спірыдонава); з'явіліся творы манум. скульптуры (І.Кудраўцаў). З 1970-х г. пашыраны манум. і манум.-дэкар. (Р.Фёдараў, В.Пятроў, М.Вядзернікаў), тэатр.-дэкарацыйнае (К.Васільеў, П.Дзмітрыеў, Я.Бургулаў) мастацтва, станковы жывапіс (А.Мяснікоў, У.Мазанаў, В.Гунько, В.Макараў), графіка (Ф.Быкаў, Осіпаў,

Да арт. **Чувашыя**. Будынак сельскагаспадарчага інстытута ў Чэбаксарах.

Да арт. **Чувашыя**. Увядзенскі сабор у Чэбаксарах.

Да арт. **Чувашыя**. Троіцкі сабор у г. Цывільск.

Да арт. **Чувашыя**. Будынак мастацкага музея ў Чэбаксарах.

П.Сізоў, Г.Харламп'еў, А.Мітоў), скульптура (Г.Спірыдонаў, Кудраўцаў, В.Бажынаў). Для нар. мастацтва характэрны ўзорыстае ткацтва, вышыўка, выцінанка бісерам і серабром, трохгранна-выемчатая разьба на прадметах хатняга ўжытку і мэблі (К.Яфрэмава, А.Ільбекава, М.Сімакова). У 1933 утвораны Саюз мастакоў Ч. У 1918 у Казані пастаўлены першы спектакль на чув. мове («Не жыві так, як хочацца» А.М.Астроўскага). Працуюць т-ры: Чув. акад. драм. імя К.В.Іванова, рус. драм., эксперым. т-р драмы, юнага гледача, лялечны.

Літаратура развіваецца на *чувашскай мове*. Першыя запісы чув. фальклору (сказанні, гіст. і быт. песні і паданні, казкі) адносяцца да 18 ст. У сярэдзіне 19 ст. выступіў першы чув. пісьменнік С.Міхайлаў. У 1870-я г. на аснове створанай І.Якаўлевым новай пісьменнасці зарадзілася арыгінальная нац. л-ра (І.Іваноў, М.Фёдараў, І.Юркін). Пачынальнік нац. л-ры — К.*Іваноў*. У пач. 20 ст. выступілі паэты М.Акімаў, Ц.Тайр, Я.Турхан, М.Шэлебі. Рэфарматарам верша быў М.*Сеспель*. У 1920—30-я г. развівалася паэзія (І.Ахах, М.Шубасіні, С.Эльгер), проза (Д.Ісаеў, М.Трубіна, С.Фамін), драматургія (І.Максімаў-Кашкінскі, П.Осіпаў). Асн. тэмы — мірнае будаўніцтва, індустрыялізацыя і калектывізацыя, праблемы псіхалогіі людзей (творы П.*Хузангая*, І.Іўніка, В.Краснова-Аслі, В.Міты, А.Талвіра, І.Тукташа). У пасляваен. гады ў л-ры вяліся пошукі новых жанравых форм і стыляў. Распрацоўваліся тэмы вайны, пасляваен. жыцця, духоўныя праблемы грамадства (Максімаў-Кашкінскі, Осіпаў, Я.*Ухсай*, Ф.Уяр, П.Хузангай, М.Цярэнцьеў). Вылучыліся творы на гіст. тэматыку С.Аслана, М.Ільбекава, К.Турхана, Уяра і інш. У 1970—90-я г. л-ру Ч. прадстаўлялі празаікі Ф.Агівер, А.Арцем'еў, Дз.Гардзееў, А.Емяльянаў, М.Максімаў, Ю.Скварцоў, М.Юхма; паэты Ю.Айдаш, П.Афанасьеў, В.Ахун, Ю.Семендэр, М.Сеніэль, М.Тэветкель, В.Цімакоў, П.Эйзін, В.Эндып, Г.Юмарт, Г.Яфімаў; драматургі М.Сідараў, Б.Чындыкоў, Цярэнцьеў; літаратуразнаўцы і крытыкі Ю.Арцем'еў, М.Сіроткін, Г.Фёдараў, Г.Хлебнікаў, А.Хузангай і інш. У 1934 створаны Саюз пісьменнікаў Ч. На бел. мове выдадзены «Чувашскія апавяданні» (1966), «Песні волжскага краю» (1988), творы Талвіра («У нас на Буле», 1961), Л.Агакава («Салдацкія дзеці», 1977), Г.Арлова («Расказы дзядзькі Трывіма», 1988). Сярод перакладчыкаў на бел. мову В.Зуёнак, К.Камейша, Х.Лялько, П.Макаль, У.Паўлаў, П.Прыходзька, А.Пысін, Ю.Свірка, М.Чарняўскі, Я.Яншчыц і інш.

Ладавая аснова чув. нар. музыкі — пентатоніка. У фальклоры пераважае аднагалоссе. Паводле тыпу мелодыкі песні падзяляюцца на працяжныя (вясельныя, рэкруцкія, пахавальныя), паўпрацяжныя (прац., калыханкі, лірычныя, карагодныя), хуткія (дзіцячыя, жартоўныя, гульнявыя). З нар. інструментаў: кесле (гуслі), скрыпка, сарнай (валынка), шахліч (род флейты). Прафес. муз. культура пачала складвацца ў 1920-я г.: В.Вараб'ёў, Р.Ліскоў, С.Максімаў, Ф.Паўлаў (аўтар першага сімф. твора). Першая чув. муз. камедыя «Радасць» У.Крываносава (паст. 1935). На станаўленне прафес. муз. творчасці ў песенна-хар. жанры паўплывалі С.Габер, М.Каваль, А.Леман, І.Люблін, М.Мяскоўскі і інш. З 2-й пал. 20 ст. найб. пашыраны жанры шматгалосай хар. музыкі; сярод дзеячаў муз. мастацтва: кампазітары Р.Аляксандраў, М.Аляксееў, А.Арлоў-Шузьм, А.Асламас, А.Васільеў, Ф.Васільеў, П.Лукін, Максімаў, А.Пятроў, А.Токараў, Ц.Фандзееў, В.Хадзяшаў, Р.Хірбю; спевакі І.Васільеў, М.Дзяніса ў, П.Заломнаў, Т.Чумакова; салістка балета Н.Паўлава (пачала свой творчы шлях у Чэбаксарах). Працуюць: Чув. т-р оперы і балета (з 1969, да 1993 Чув. муз.

Да арт. **Чувашыя**. П.Сізоў. Нарспі. 1969.

т-р), сімф. арк. (1932), філармонія (1936), ансамбль песні і танца (з 1924), хор радыё і тэлебачання; муз. вучылішча (1929), муз.-пед. ф-т пры Чув. пед. ін-це (1964), муз. школы. Штогод праводзяцца фестывалі: міжнар. оперны імя М.Д.Міхайлава (з 1991), усерас. нар. творчасці «Крыніцы Паволжа» (з 1993) і інш. У 1940 засн. Саюз кампазітараў Ч.

Літ.: Чувашская АССР: Очерки о природе. Чебоксары, 1952; Кураков Л.П., Федоров Н.В. Состояние и перспективы развития экономики Чувашской Республики. М., 1997; Краткая чувашская энциклопедия. Чебоксары, 2001; Ковалевский А.П. Чуваши и булгары по данным Ахмеда ибн-Фадлана. Чебоксары, 1954; История Чувашской АССР. Т. 1—2. Чебоксары, 1966—67; История Чувашской АССР. Т. 1. Чебоксары, 1983; Дмитриев В.Д. Чувашские исторические предания. Чебоксары, 1983; Яго ж. Чувашия в эпоху феодализма. Чебоксары, 1986; История Чувашской Республики, 1775—1990: Библиогр. указ. Чебоксары, 1996; Каховский В.Ф. Происхождение чувашского народа. Чебоксары, 1965; Археология и этнография Чувашской АССР: Библиогр. указ. Чебоксары, 1986; Этническая история и культура чувашей Поволжья и Приуралья. Чебоксары, 1993; Иванов В.П. Чувашия: история и культура. Чебоксары, 2000; Яго ж. Чувашский этнос. Чебоксары, 1998; Чуваши: этнич. история и традиционная культура. М., 2000; Сироткин М.Я. Очерки дореволюционной чувашской литературы. 2 изд. Чебоксары, 1967; Хлебников Г.Я. Современная чувашская литература. Чебоксары, 1971; Юрьев М.И., Романова З.В. Писатели Советской Чувашии: Биобиблиогр. справ. Чебоксары, 1988; Чувашское литературоведение и критика: Библиогр. указ. Чебоксары, 1993; Федоров Г.И. Художественный мир чувашской литературы. Чебоксары, 1996; Дмитриев А. Литературный Слакбаш. Чебоксары, 1996; Никитин Г.А., Крюкова Т.А. Чувашское народное изобразительное искусство. Чебоксары, 1960; Меджитова Э.Д., Трофимов А.А. Чувашское народное искусство: Альбом. Чебоксары, 1981; Можаров Г.Г., Никитин А.С. Памятные места и достопримечательности города Чебоксары и Чувашской АССР. Чебоксары, 1987; Ургалкина Н.А. Художники Чувашии: Биобиблиогр. указ. Чебоксары, 1989; Илюхин Ю.А. Музыкальная культура Чувашии. Чебоксары, 1961; Яго ж. Композиторы Советской Чувашии. Чебоксары, 1978; Эррэ Т.А. Чувашская опера. Чебоксары, 1979; Сергеев Т.С.

Да арт. **Чувашыя**. М.Свярчкоў. А.С.Пушкін у чувашскай вёсцы. 1950.

Культура Советской Чувашии: (к 70-летию автономии республики). Чебоксары, 1989; Скворцов М.И. Культура Чувашского края. М., 1995.

К.Ф.Быкаў (прырода, гаспадарка), *Ю.В.Бажэнаў, Дз.Н.Міхлееў* (гісторыя), *Дз.Н.Міхлееў* (культура).

ЧУГА́ЕЎ Леў Аляксандравіч (16.10.1873, Масква — 23.9.1922), расійскі хімік, стваральнік навук. школы па хіміі комплексных злучэнняў. Скончыў Маскоўскі ун-т (1895). З 1895 заг. хім. аддзялення Бактэрыял. ін-та ў Маскве. З 1904 праф. Маскоўскага тэхн. вучылішча, у 1908—22 — С.-Пецярбургскага ун-та. Заснавальнік і дырэктар (з 1918) Ін-та па вывучэнні плаціны і інш. высакародных металаў. Навук. працы па хіміі тэрпенаў; распрацаваў метад вызначэння рухомых атамаў вадароду ў арган. злучэннях. Адкрыў і вывучыў анамальную вярчальную дысперсію арган. малекул з 2 асіметрычнымі цэнтрамі. Адкрыў адчувальныя аналіт. рэакцыі на металы VIII групы перыяд. сістэмы элементаў (1906). Прэмія імя У.І.Леніна 1927.

Тв.: Избр. труды. Т. 1—3. М., 1954—62.

ЧУДАКО́Ў Алег Парфір'евіч (н. 23.10.1940, г.п. Сураж Віцебскай вобл.), бел. вучоны ў галіне сківічна-тваравай хірургіі. Заснавальнік і прэзідэнт Бел. асацыяцыі сківічна-тваравых хірургаў. Д-р мед. н. (1975), праф. (1977). Засл. дз. нав. Беларусі (1997). Скончыў Пермскі мед. ін-т (1964). З 1968 у Цюменскім мед. ін-це (з 1979 заг. кафедры). З 1980 у Мінскім мед. ун-це (заг. кафедры), адначасова (1986—88) прарэктар па навук. рабоце. З 1992 гал. спецыяліст па сківічна-тварнай і пластычнай хірургіі. Навук. працы па метадах пластычнага аднаўлення вял. дэфектаў твару і шыі.

Тв.: Компрессионно-дистракционный метод остеосинтеза в костной пластике нижней челюсти. Мн., 1985; Травматические переломы нижней челюсти, их осложнения и лечение. Мн., 1989.

ЧУДАКО́Ў Барыс Сцяпанавіч (н. 8.6.1932, станіца Сляпцоўская Сунжанскага р-на, Інгушэція), бел. ваенны дырыжор. Засл. арт. Беларусі (1981). Скончыў Ін-т ваен. дырыжораў Мін-ва абароны СССР (1954). З 1954 дырыжор вайск. часці БВА, з 1961 у Мінскім суворaўскім ваен. вучылішчы, з 1968 дырыжор аркестра штаба БВА, з 1979 нач. арк. службы БВА. З 1989 выкладае ў Бел. акадэміі музыкі. Сярод пералажэнняў Ч. для духавога аркестра творы бел. кампазітараў У.Алоўнікава, Г.Вагнера, Я.Глебава, І.Лучанка, Ю.Семянякі, Дз.Смольскага, муз. класікі і інш. Інструментаваў для духавога аркестра Дзярж. гімн Рэспублікі Беларусь (2002). Гал. дырыжор Рэсп. (1987) і абл. «Майскі вальс» (штогодняе, з 1992) свят духавой музыкі. *А.Л.Карацееў.*

ЧУДАКО́Ў Давід Абрамавіч (23.6.1902, г.Сураж Бранскай вобл., Расія — 1983), бел. вучоны ў галіне трактарабудавання. Д-р тэхн. н. (1955), праф. (1956). Засл. дз. нав. Беларусі (1968). Скончыў С.-г. акадэмію імя Цімірязева (1927). У 1955—72 заг. кафедры Бел. ін-та механізацыі сельскай гаспадаркі. Навук. працы па асновах тэорыі с.-г. навясных агрэгатаў, тэорыі трактара і разліку яго механізмаў. Узначальваў распрацоўку трактарных гідрапад'ёмнікаў для кіравання навяснымі с.-г. машынамі.

Тв.: Основы теории и расчета трактора и автомобиля. 2 изд. М., 1972. *Л.В.Бароўка.*

ЧУДАКО́Ў Яўген Аляксеевіч (1.9.1890, г. Плаўск Тульскай вобл., Расія — 19.9.1953), расійскі вучоны ў галіне машыназнаўства і аўтамаб. тэхнікі. Акад.

Л.А.Чугаеў.

Я.А.Чудакоў.

АН СССР (1939; чл.-кар. 1933). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча (1916), дзе працаваў у 1918—28 і з 1936 (заг. кафедры). З 1921 дырэктар Навук. аўтаматорнага ін-та, з 1930 нам. дырэктара, заг. сектара Навук. аўтатрактарнага ін-та. З 1939 дырэктар Ін-та машыназнаўства АН СССР. У 1939—42 віцэ-прэзідэнт АН СССР. Навук. працы па праблемах устойлівасці аўтамабіля, трываласці і зносаўстойлівасці яго дэталей. Дзярж. прэміі СССР 1943, 1951.

Тв.: Теория автомобиля. 3 изд. М.; Л., 1950.

ЧУ́ДАЎ МАНАСТЫ́Р, Аляксееўскі Архангела-Міхайлаўскі, мужчынскі манастыр рус. правасл. царквы ў Маскоўскім Крамлі. Засн. каля 1358—65 мітрапалітам *Аляксеем*. Да 1561 яго ігумен лічыўся першым сярод ігуменаў рас. манастыроў. З канца 14 ст. цэнтр кнігапісання. У 17 ст. ў манастыры дзейнічала грэка-лац. вучылішча. Скасаваны пасля Кастр. рэвалюцыі 1917, будынкі (16—19 ст.) знесены ў 1930-я г. Збор рукапісаў Ч.м. 11—13 ст. зберагаецца ў Гіст. музеі Масквы.

ЧУ́ДЗІН, вёска ў Ганцавіцкім р-не Брэсцкай вобл., на р. Лань, на аўтадарозе Ганцавічы—Чырвоная Слабада. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 40 км на У ад горада і чыг. ст. Ганцавічы, 286 км ад Брэста. 1016 ж., 411 двароў (2003). Лясніцтва. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Малітоўны дом евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Брацкія магілы партызан і ахвяр фашызму. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — Свята-Георгіеўская царква (1867).

ЧУ́ДЗІНСКІ БОЙ 1942, бой партыз. атрада В.А.Васільева па разгроме ням. гарнізона ў в. Чудзін Ганцавіцкага р-на Брэсцкай вобл. ў Вял. Айч. вайну. Гарнізон (каля 400 гітлераўцаў), узброены вінтоўкамі і 4 кулямётамі закрываў партызанам выхад цераз р. Морач у лясы Ганцавіцкага р-на. У ноч на 11 кастр. партызаны сканцэнтраваліся на Пн ад в. Чудзін, зрабілі засады на шляхах магчымага адступлення праціўніка. На досвітку ў выніку 1,5-гадзіннага бою часткова быў знішчаны ўзвод аховы гарнізона, але частка гітлераўцаў вырвалася і схавалася ў балотах. Партызаны захапілі 6 радыёпрыёмнікаў, вінтоўкі, запас патронаў, веласіпеды і інш. Гарнізон не адноўлены, што пашырыла партыз. зону. *М.Ф.Шумейка.*

ЧУДЗЬ, назва ў рускіх летапісах *эстаў* (эстонцаў), а таксама інш. фіна-угорскіх плямён, што жылі ва ўладаннях *Наўгародскай феадальнай рэспублікі* або ў суседніх з ёй рэгіёнах, на У ад Анежскага воз. — на р. Анега і Паўн. Дзвіна.

ЧУ́ДСКА-ПСКО́ЎСКАЕ ВО́ЗЕРА, Гдоўскае, Пейпсі. У Эстоніі і Пскоўскай вобл. Расіі. Пл. 3,5 тыс. км². Глыб. да 15 м. Складаецца з *Чудскога возера, Пскоўскага возера* і праліва, што іх злучае (Цёплае возера). З'яўляецца рэліктам вял. ледавіковага вадаёма. Берагі пераважна нізінныя, тарфяныя, затапляюцца ў паводку; на плоскім дне магутная тоўшча ілу. Уздоўж паўн. і ўсх. берагоў Чудскога воз. цягнецца пясчаны *бар*, месцамі парослы хвояй. Шмат астравоў, найбуйн. — Пірысар (Порка). Упадае каля 30 рэк (найбольшыя Вялікая і Эмайыгі), выцякае р. Нарва. Замярзае ў ліст., крыгалом у маі. Згонна-нагонныя з'явы. Суднаходства. Рыбалоўства.

ЧУДСКО́Е ВО́ЗЕРА (эст. Пейпсіярв). На мяжы Эстоніі і Пскоўскай вобл. Расіі. Пл. 2,6 тыс. км². Складае адзіны вадаём з Пскоўскім воз. (гл. *Чудска-Пскоўскае возера*). У 1242 на Ч.в. адбылася бітва рус. войска з ням.-тэўтонскімі рыцарамі (гл. *Лядовае пабоішча 1242*).

ЧУЖА́Я МО́ВА, 1) выказванне іншай асобы, выкладзенае аўтарам або апавядальнікам. У залежнасці ад лексіка-сінтакс. сродкаў і спосабаў перадачы Ч.м. адрозніваюцца *прамая мова, ускосная мова* і няўласна-прамая мова. Шырокае выкарыстанне Ч.м. — характэрная асаблівасць *мастацкага стылю* і *размоўнага стылю*.

Кожная з разнавіднасцей Ч.м. мае свае стыліст. асаблівасці. Прамая мова, якая дакладна адлюстроўвае мову персанажа, а таксама ўключае словы аўтара, дапамагае пісьменніку адлюстраваць моўныя асаблівасці геро-

яў, іх паводзіны, характар, зрабіць вобраз больш жыццёвым. Ускосная мова, якая перадае чужое выказванне з пункта гледжання і ад імя аўтара ці апавядальніка, дазваляе больш яскрава выказаць аўтарскую ацэнку падзеі, з'явы, паведамлення. У няўласна-прамой мове захоўваюцца асн. лексічныя, сінтаксічныя і інш. асаблівасці Ч.м., нярэдка выяўляюцца і адносіны аўтара да таго, што думае, гаворыць, робіць персанаж. Прыклады Ч.м.: «Калі вобыск быў скончаны, ротмістр строга сказаў Лабановічу: «Калі вы ў трохдзённы тэрмін не выдзеце самі, дык я вас арыштую і адашлю этапам да месца вашага пражывання» (Я.Колас; прамая мова); «Калі вобыск быў скончаны, ротмістр катэгарычна заявіў Лабановічу, каб ён пакінуў горад, калі не хоча быць высланым па этапе» (ускосная мова); «Ротмістр скончыў вобыск і катэгарычна заявіў: калі Лабановіч у трохдзённы тэрмін не выедзе сам, дык яго арыштуюць і адашлюць этапам да месца яго пражывання» (няўласна-прамая мова).

2) Замежная мова ў тэксце мастацкага, навук., публіцыстычнага і інш. твораў. У маст. л-ры Ч.м. звычайна — выказванне персанажа на роднай або характэрнай для яго і чужой аўтарскаму апавяданню мове. У навук.-публіцыстычнай л-ры Ч.м. — цытацыя або ўстойлівыя выразы на замежнай мове. Ч.м. перадаецца літарамі адпаведнага замежнага алфавіта або літарамі аўтарскай мовы. Пераклад Ч.м. звычайна даецца ў падрадковых спасылках. Гл. таксама *Варварызм*.

Літ.: Будагов Р.А. Литературные языки и языковые стили. М., 1967; Беларуская граматыка. Ч. 2. Мн., 1986.

Л.А.Антанюк, Г.Ф.Вештарт.

ЧУЙКО́ Эдуард Аляксеевіч (н. 29.9.1939, г. Варонеж, Расія), бел. вучоны ў галіне тэлекамунікацыйных сістэм. Канд. тэхн. н. (1971), праф. (1991). Чл.-кар. Бел. інж. акадэміі (1992). Скончыў БПІ (1963). У 1963—65 на Мінскім электрамех. з-дзе. З 1974 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі (у 1978—98 заг. кафедры). У 1997—99 дырэктар Дзярж. праектнага і н.-д. ін-та «Дзіпрасувязь», з 2000 на прадпрыемстве «Сувязьінфармсервіс» (дырэктар вучэбнага цэнтра). Навук. працы па аптымізацыі сістэм шматстанцыйнага доступу. Распрацаваў шэраг метадаў аптымізацыі сістэм сродкаў зонавай і мабільнай сувязі.

Тв.: Относительные методы передачи информации. М., 1973 (разам з М.Ц.Пятровічам); Направления развития сухопутной подвижной связи в Республике Беларусь и аспекты защиты информации (разам з А.І.Кісялёвым) // Весн. сувязі. 1999. № 6.

ЧУЙКО́Ў Васіль Іванавіч (12.2.1900, г.п. Сярэбраныя Пруды Маскоўскай вобл. — 18.3.1982), савецківаначальнік. Маршал Сав. Саюза (1955), двойчы Герой Сав. Саюза (1944, 1945). Скончыў ваен. акадэмію імя М.В.Фрунзе (1925, 1927). У Чырв. Арміі з 1918. У грамадз. вайну камандзір роты, палка, удзельнік баёў з войскамі А.В.Калчака на Урале і ў Сібіры, з польскімі інтэрвентамі — на Беларусі. За баі каля г. Лепель (1920) узнагароджаны 2-м ордэнам Чырв. Сцяга (1925). З 1927 ваен. саветнік у Кітаі, з 1929 на штабных і камандных пасадах у РСЧА. З ліп. 1938 камандз. Бабруйскай армейскай групай Бел. асобай ваен. акругі, потым 4-й арміяй, якая ў вер. 1939 удзельнічала ў паходзе Чырв. Арміі ў Зах. Беларусь. У *савецка-фінляндскую вайну 1939—40* камандз. 9-й арміяй. У снеж. 1940 — сак. 1942 ваен. аташэ ў Кітаі. У Вял. Айч. вайну з мая 1942 камандз. 1-й рэзервовай (з ліп. 1942 — 64-я) арміяй, у вер. 1942 — крас. 1943 — 62-й арміяй, якая вытрымала ўвесь цяжар абарончых баёў за Сталінград (гл. таксама *Сталінградская бітва 1942—43*), а потым прымала ўдзел у разгроме сталінградскай групоўкі ням.-фаш. войск. З крас. 1943 камандз. 8-й гвардз. арміяй (пераўтворана з 62-й), якая ўдзельнічала ў вызваленні Данбаса (1943), *бітве за Дняпро 1943*, шэрагу інш. баявых аперацый (у т.л. ў *Беларускай аперацыі 1944*) і ў штурме Берліна (крас.—май 1945). Пасля вайны нам. галоўнакаманд. (з 1945), галоўнакаманд. (з 1949) Групай сав. войск у Германіі, камандз. войскамі Кіеўскай ваен. акругі (з 1953), галоўнакаманд. Сухапутнымі войскамі і нам. міністра абароны СССР (1960—64). Пахаваны ў Валгаградзе на Мамаевым кургане.

Тв.: От Сталинграда до Берлина. М., 1985.

М.Г.Нікіцін.

ЧУЙКО́Ў Сямён Апанасавіч (30.10.1902, Бішкек — 18.5.1980), кіргізскі жывапісец. Нар. маст. СССР (1963). Правадз. чл. АМ СССР (1958). Вучыўся ў М.Хлудава ў г. Алматы, у Маскоўскім вышэйшым маст.-тэхн. ін-це (1924—30). У 1930—32 выкладаў у Ленінградскай АМ, у 1947—48 у Маскоўскім маст. ін-це. Абапіраючыся на традыцыі рус. выяўл. мастацтва, распрацоўваў жанравы і пейзажны кірг. жывапіс; у 1950—60-я г. звяртаўся да інд. тэматыкі. Творы вылучаюцца строгасцю кампазіцыі, тонкай распрацоўкай колеравых суадносін: цыклы «Киргизская калгасная сюита» (1939—48), «У нас у Кіргізіі» (1946—67), «Нашы браты» (1952—67), работы «Дачка савецкай Кіргізіі» (1948), «Дачка чабана» (1956), «Дакрананне да вечнасці» (1973), «Мары» (1975), «Аўтапартрэт са статуяй» (1979). Дзярж. прэміі СССР 1949, 1951. Дзярж. прэмія Кыргызстана імя І.Сатылганава 1972.

ЧУ́ЙСКАЯ ДАЛІ́НА. У сярэднім цячэнні р. Чу, ад Баамскай цясніны да ўсх. ўскраіны пустыні Муюнкум, у Кыргызстане і Казахстане. Даўж. каля 200 км, шыр. ад 15 км на ПдУ да 100 км на ПнЗ, выш. 500—1200 м. Клімат рэзка кантынентальны. Ападкаў 250—400 мм за год. Амаль уся разарана, арашаецца водамі р. Чу і яе прытокаў. Пасевы цукр. буракоў, збожжавых культур. Садаводства, вінаградарства. На Пд — г. Бішкек.

ЧУ́ЙСКІ СТЭП, міжгорная катлавіна на ПдУ Алтая, паміж Курайскім хр. на Пн і Паўд.-Чуйскім хр. на Пд, у верхнім цячэнні р. Чуя (бас. р. Об). Даўж. да 70 км. Выш. 1750—2200 м. Пераважаюць паўпустыні, што выкарыстоўваюцца як пашы. Цераз Ч.с. пралягае Чуйскі тракт — участак аўтадарогі даўж. 626 км ад г. Новасібірск (Расія) да мяжы з Манголіяй.

ЧУ́ЙСКІЯ БЯЛКІ́, два высакагорныя хрыбты ў цэнтр. ч. Алтая, злучаныя папярочным горным ланцугом, паміж далінай Джазатора на Пд і ўпадзінамі Чуйскага і Курайскага стэпаў і далінай р. Шаўла на Пн. Выш. да 4173 м (Паўн.-Чуйскі хр.) і да 3960 м (Паўд.-Чуйскі хр.).

ЧУКО́ЎСКІ Карней Іванавіч (сапр. Карнейчукоў Мікалай Васілевіч; 31.3.1882, С.-Пецярбург — 28.10.1969), рускі пісьменнік, крытык, дзіцячы паэт, літ.-знавец, перакладчык. Д-р філал. н. (1957). Аўтар казак у вершах «Кракадзіл» (1916), «Мыйдадзір» (1923, паст. 1938, Дзярж. т-р лялек Беларусі), «Тараканішча» (1923), «Муха-цакатуха» (1924), «Бармалей» (1925), «Гэлефон», «Хвядорына гора» (абедзве 1926), «Айбаліт» (1929), «Лімпапо» (1935). Асн. асаблівасці яго паэт. свету — багацце і

В.І.**Чуйкоў**.

К.І.**Чукоўскі**.

зменлівасць зрокавых вобразаў, мілагучнасць паэт. мовы, рухомасць рытму, дакладнасць і лаканічнасць паэт. выказвання, гульнёвы характар вершаваных твораў. Аўтар даследавання «Майстэрства Някрасава» (1952, Ленінская прэмія 1962), літ.-крыт. эсэ пра пісьменнікаў і дзеячаў культуры (кн. «Сучаснікі», 1962). Адзін з заснавальнікаў сав. школы тэорыі маст. перакладу («Прынцыпы мастацкага перакладу», 1919; «Высокае майстэрства», 1941), яму належаць лепшыя ў сусв. л-ры пераклады У.Уітмена (1907, «Мой Уітмен», 2-е выд. 1969).

Неаднаразова бываў на Беларусі, высока цаніў М.Багдановіча, асабліва вылучаў Я.Купалу і Я.Коласа, з якімі быў асабіста знаёмы. Традыцыі Ч. знайшлі працяг у лінгва-псіхал. даследаваннях дзяцей у В.Віткі (кнігі «Дзеці і мы», 1977; «Урокі», 1982). Некат. апавяданні Я.Маўра створаны на ўзор «Блытаніны» Ч. Бел. перакладчыкі Ю.Гаўрук, У.Дубоўка, А.Зарыцкі, А.Куляшоў, Я.Сіпакоў і інш. перанялі ад Ч. метад творчага ўзнаўлення арыгінала сродкамі роднай мовы. На

бел. мову творы Ч. перакладаюцца з 1930-х г. Сярод перакладчыкаў яго дзіцячых кніг А.Якімовіч, Зарыцкі, К.Кірэенка, У.Шахавец.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—6. М., 1965—69; От двух до пяти. Мн., 1982; Бел. пер. — Мыйдадзір. Мн., 1953; Казкі. Мн., 1959.

Літ.: Петровский М. Книга о Корнее Чуковском. М., 1966; Смирнова В. О детях и для детей. 2 изд. М., 1967.

Т.В.Кабржыцкая.

ЧУКО́ЦКАЕ МО́РА, ускраіннае мора Паўн. Ледавітага ак., каля берагоў Азіі і Паўн. Амерыкі. Абмывае паўн. берагі Чукоцкага п-ва і паўн.-зах. берагі Аляскі. Злучаецца Берынгавым пралівам з Ціхім ак. і пралівам Лонга з Усх.-Сібірскім морам. Пл. 595 тыс. км^2. Пераважныя глыбіні 25—30 м, на Пн павялічваюцца да 200 м. Найб. глыб. 1256 м. Берагавая лінія слаба парэзана. Берагі пераважна гарыстыя, шмат лагун і намыўных кос. Буйныя залівы: Калючынская губа, Кацэбу. А-вы Урангеля, Геральд і Калючын. Клімат арктычны. Сярэдняя т-ра лют. ад -21 да -27 °С, ліп. 2,5—3,5 °С. Летам т-ра вады на паверхні ад 4 да 12 °С, зімой ад -1,6 да -1,8 °С; б.ч. года ўкрыта таросістымі льдамі, ад якіх часткова вызваляецца на Пд у канцы лета. Салёнасць вады 24—32‰. Прылівы паўсутачныя на З і няправільныя паўсутачныя на У (0,1—0,2 м). Рыбалоўства (галец, палярная траска), промысел маржоў, цюленяў, нерпы. Найбуйн. порт — Уэлен (Чукоцкі п-аў).

ЧУКО́ЦКАЕ НАГО́Р'Е. На Чукоцкім п-ве ў Чукоцкай аўт. акрузе Расіі, паміж Чаўнскай губой і Берынгавым пралівам. Даўж. каля 450 км, пераважаюць выш. да 500—700 м, макс. 1843 м (г. Ісходная). Сістэма моцна расчлянёных нізкагорных і сярэднягорных хрыбтоў і масіваў. Паўн. хрыбты складзены пераважна з пясчанікаў і сланцаў, прарваных гранітамі; на Пд пераважаюць вулканагенныя адклады. Радовішчы волава, ртуці, каменнага вугалю. Клімат суровы. Водападзел рэк бас. Паўн. Ледавітага і Ціхага акіянаў. На ніжняй ч. схілаў пераважна горныя тундры, на вяршынях арктычная горная пустыня. Ледавікі, снежнікі.

ЧУКО́ЦКА-КАМЧА́ЦКІЯ МО́ВЫ, група роднасных моў насельніцтва Чукоцкага п-ва і Камчаткі. Часам іх адносяць да сям'і палеаазіяцкіх моў. Уключаюць: чукоцкую, каракскую, алюторскую, керэкскую, ітэльменскую мовы. Падзяляюцца на 2 групы: чукоцка-каракскую і ітэльменскую, межы і адносіны паміж якімі канчаткова не высветлены. У фанет. сістэмах Ч.-к.м. невял. колькасць зычных, пераважаюць санорныя; характэрная рыса вакалізму — сінгарманізм. Адносяцца да аглюцінатыўных моў прэфіксальна-суфіксальнага тыпу з наяўнасцю разрыўных афіксаў, з аднатыпнай па структуры сістэмай скланення і спражэння; у некат. мовах захаваўся падвойны лік; у пэўных сінтакс. пазіцыях назоўнікі змяняюцца па асобах. У сінтаксісе проціпастаўляюцца намінатыўныя і эргатыўная канструкцыі, пашыраны дзеепрыслоўныя і дзеепрыметныя звароты, могуць утвараць сінтакс. карпаратыўныя комплексы. Багатая сістэма словаўтварэння. У лексіцы запазычанні з рус. моў. Чукоцкая і каракская мовы маюць пісьменнасць, створаную ў 1931 на аснове лац., з 1936 — на аснове рус. графікі.

Літ.: Скорик П.Я. Чукотско-камчатские языки // Языки народов СССР. Л., 1968. Т. 5.

А.Я.Міхневіч.

ЧУКО́ЦКАЯ АЎТАНО́МНАЯ АКРУ́ГА. Размешчана на крайнім ПнУ Рас. Федэрацыі. Утворана 10.12.1930. Займае *Чукоцкі паўвостраў*, прылеглую ч. мацерыка і а-вы Урангеля, Аён, Ратманава і інш., абмываецца Усх.-Сібірскім, Чукоцкім і Берынгавым морамі. Пл. 737,7 тыс. км^2. Нас. 75,3 тыс. чал. (2001), гарадскога 68%. Цэнтр — г. *Анадыр*. Гарады: Білібіна, Певек.



Рэльеф пераважна гарысты. На ПнУ — *Чукоцкае нагор'е* (выш. да 1843 м), на З — Анюйскі хр., у цэнтры — Анадырскае пласкагор'е, на Пд — адгор'і Каракскага нагор'я. Карысныя выкапні: золата, волава, вальфрам, ртуць, медзь, каменны і буры вугаль, газ і інш. Клімат суровы: на ўзбярэжжы марскі, ва ўнутр. раёнах рэзка кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад -15 да -39 °С, ліп. 5—10 °С. Ападкаў 200—500 мм за год. Пашырана вечная мерзлата. Гал. рэкі — Анадыр з прытокамі Майн, Белая, Танюрэр, Вялікая, Амгуэма, Амалон, Вял. і Малы Анюй. Шмат азёр. Глебы пераважна горна-тундравыя і тарфяна-глеевыя. Расліннасць тундравая і лесатундравая, на ўзбярэжжы і астравах арктычная пустыня. Запаведнік — Востраў Урангеля.

Асн. галіна прам-сці — горназдабыўная (золата, волава, вальфрам, ртуць, каменны і буры вугаль). Горна-абагачальныя камбінаты ў гарадах Білібіна, Певек, г.п. Эгвекінот, Іульцін і інш. Выпрацоўка электраэнергіі 613 млн. кВт·гадз (2000). Білібінская АЦЭС, Чаўнская і Анадырская ЦЭЦ, Берынгаўская і Эгвекіноцкая ГЭС, плывучая электрастанцыя «Паўночнае ззянне» на мысе Шміта. Рамонтна-мех., суднарамонтныя, харч. прам-сці (рыбазавод, мяса-малочныя камбінаты) прадпрыемствы. Аленегадоўля. Рыбалоўства, паляванне на пушнога і марскога звера. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней, птушак. Зверагадоўля. Парнікова-цяплічная гаспадарка. Асн. віды транспарту — марскі і паветраны. Марскія парты: Певек, Правідзенне, Анадыр, Эгвекінот. Даўж. аўтадарог з цвёрдым пакрыццём 1279 км. Суднаходства па рэках Анадыр, Вялікая, Вял. і Малы Анюй.

Літ.: История и культура чукчей. Л., 1987.

ЧУКО́ЦКІ ПАЎВО́СТРАЎ, Чукотка. На ПнУ Азіі, у Чукоцкай аўт. акрузе Расіі. Пл. 49 тыс. км^2. Аддзелены ад Паўн. Амерыкі Берынгавым прал., абмываецца Анадырскім зал. Берынгава м. і Чукоцкім морам. Берагі моцна парэзаны: на Пн — Калючынская губа, на ПдУ — Мечыгменскі зал., на ПдЗ — заліў Крыжа; паўн.-ўсх. край Ч.п. — *Дзяжнёва мыс*. Б.ч. п-ва занята *Чукоцкім нагор'ем*. У рэльефе пераважаюць купалападобныя ўзвышшы, падзеленыя ўпадзінамі; хрыбты выш. 400—500 м. Горна-тундравыя ландшафты. Карысныя выкапні: волава, вальфрам, золата і інш.

ЧУ́КЧЫ (саманазва л ы г ' о р а в э т л ' а н — сапраўдныя людзі), народ у Рас. Федэрацыі (15,1 тыс. чал., 1995), карэннае насельніцтва *Чукоцкай аўтаномнай акругі* (каля 12 тыс. чал.). Жывуць таксама ў Каракскай аўт. акрузе (1,5 тыс. чал.) і ў Ніжнекалымскім р-не Якуціі (1,3 тыс. чал.). Гавораць на чукоцкай мове. Частка вернікаў праваслаўныя, большасць прытрымліваецца традыц. вераванняў.

ЧУЛА́КІ Міхаіл Іванавіч (19.11.1908, г. Сімферопаль, Рэспубліка Крым — 29.1.1989), расійскі кампазітар, педагог, муз.-грамадскі дзеяч. Нар. арт. Расіі (1969). Скончыў Ленінградскую кансерваторыю (1931, кл. кампазіцыі У.Шчарбачова). У 1937—39 дырэктар і маст. кіраўнік Ленінградскай філармоніі. З 1951 працаваў у К-це па справах мастацтваў пры СМ СССР, у Мін-ве культуры СССР. У 1955—59 і ў 1963—70 дырэктар і маст. кіраўнік Вял. т-ра ў Маскве. З 1933 выкладаў у Ленінградскай, з 1948 — у Маскоўскай (з 1962 праф.) кансерваторыях. Сярод твораў: балеты «Казка пра папа і работніка яго Балду» (паст. 1940), «Уяўны жаніх» (паст. 1946), «Юнацтва» (паст. 1947), «Іван Грозны» (на аснове музыкі С.Пракоф'ева да аднайм. балета, паст. 1975); опера «Малады марак сусвету» (1977); 4 сімфоніі

(1930—87), сімф. цыкл «Песні і танцы старой Францыі» (1959), кантаты. Аўтар кніг «Інструменты сімфанічнага аркестра» (1950), «Жывыя ў памяці маёй» (1990), муз.-крытычных артыкулаў. З 1948 сакратар Саюза кампазітараў СССР, з 1959 — Саюза кампазітараў Расіі. Дзярж. прэміі СССР 1947, 1948, 1950.

ЧУЛКО́Ў Міхаіл Дзмітрыевіч (1743 або 1744, Масква — 4.11.1792), рускі пісьменнік, гісторык, этнограф, эканаміст. Быў акцёрам, прыдворным лакеем, чыноўнікам Сената; у 1779 атрымаў спадчыннае дваранства. Аўтар зб. шахрайскіх навел і чарадзейна-рыцарскіх аповесцей «Перасмешнік, або Славенскія казкі» (ч. 1—5, 1766—89), у якім упершыню ў рус. л-ры выкарыстана слав. міфалогія, затым сістэматызаваная ім у спец. міфалагічных слоўніках (самы поўны «Абэвэга рускіх забабонаў...», 1786). Яго твор «Прыгожая паварыха, або Прыгода распуснай жанчыны» (1770, няскончаны) — першая спроба рус. шахрайскага рамана, напісанага ад асобы гераіні. Складальнік «Збору розных песень» (т. 1—4, 1770—74), «Слоўніка рускіх забабонаў» (1782). Працаваў над зборам заканад. актаў і інш. дакументаў пра гандаль «Гістарычнае апісанне расійскай камерцыі...» (т. 1—7, 1781—88).

Тв.: У кн.: Поэты XVIII в. Л., 1958. Т. 1; Стихотворная сказка (новелла) XVIII — нач. XIX вв. Л., 1969; Русская проза XVIII в. М., 1971.

ЧУЛУКА́Н, адна з назваў р. *Падкаменная Тунгуска* ў Эвенкійскай аўт. акрузе Расіі.

ЧУЛЫ́М, рака, правы прыток р. Об, у Краснаярскім краі і Томскай вобл. Расіі. Даўж. 1799 км, пл. бас. 134 тыс. км^2. Утвараецца пры зліцці рэк Белы і Чорны Іюс, што бяруць пачатак у Кузнецкім Алатау. Ад месца зліцця да г. Ачынск — горная рака, ніжэй цячэ па *Чулыма-Енісейскай катлавіне*, дзе разбіваецца на рукавы і часта перамяшчаецца; потым ў шырокай пойме Чулымскай раўніны са шматлікімі азёрамі і старыцамі, рэчышча з многіх рукавоў. Гал. прытокі: Кемчуг, Чычкаюл (справа), Кія, Яя (злева). Жыўленне пераважна снегавое. Ледастаў з пач. ліст. да канца крас. — пач. мая. Сярэдні расход вады 785 м^3/с. Сплаўная. Суднаходная на 1173 км ад вусця. На Ч. гарады Назарава, Ачынск, Асіна.

ЧУЛЫ́МА-ЕНІСЕ́ЙСКАЯ КАТЛАВІ́НА. У гарах Паўд. Сібіры, у Краснаярскім краі Расіі; частка міжгорнай *Мінусінскай катлавіны*. Абмежавана з У адгор'ямі Усх. Саяна, з З — Кузнецкага Алатау, на Пн Салгонскім, на Пд Баценёўскім кражамі. Складзена пераважна з асадкавых парод і эфузіваў. Рэльеф пераважна ўзгорыста-ўвалісты, на Пд — драбнасопачны. Выш. да 550 м. На З дрэніруецца р. Чулым, на У — р. Енісей. Характэрны шырокія лагчыны, шмат азёр. На У злакавыя стэпы, на Пн і ў перадгор'ях лесастэпы. Важны с.-г. раён Краснаярскага краю. Радовішчы бурага вуталю (гл. *Канска-Ачынскі вугальны басейн*).

ЧУЛЫШМА́НСКАЕ НАГО́Р'Е. На У Алтая, паміж далінай р. Чулышман на ПдЗ і Шапшальскім хр. на ПнУ, у Рэспубліцы Алтай (Расія). Складзена ў асн. з крышт. сланцаў і гранітаў. Пераважае сярэднягорны выраўнаваны рэльеф з астанцовымі масівамі (выш. да 3148 м). На схілах лістоўнічная і кедрава-лістоўнічная тайга, вышэй 2000 м — камяністыя горныя тундры.

ЧУМ, у некаторых паўночных народаў лёгкае пераноснае жыллё конусападобнай формы з жэрдак, абцягнутых шкурамі, карой, лямцам і інш. Унутры знаходзіўся ачаг, месцы для спання, уваход завешваўся шкурамі або грубай тканінай. Дыяметр Ч. па падлозе 3—8 м, на

Жанчыны каля **чума**.

падлогу слалі бяросту, цыноўкі з лазовых дубчыкаў ці сухой травы, зверху — аленевыя шкуры. З пераходам качавых народаў да аселасці выйшаў з ужытку або выкарыстоўваецца як часовае жыллё.

ЧУМА́ ЖЫВЁЛ, група асабліва небяспечных інфекцыйных хвароб, якія характарызуюцца вострым цячэннем, высокай заражальнасцю і лятальнасцю (70—100%). Назва «чума» адносна да хвароб жывёл запазычана з мед. тэрміналогіі. Хваробы выклікаюцца вірусамі, бактэрыямі і грыбамі розных сістэм прыналежнасці. Прыродныя ачагі Ч.ж. займаюць каля 7% сушы планеты. На чуму хварэюць буйн. раг. жывёла, свінні, птушкі (гл. *Ньюкаслская хвароба*); зрэдку адзначаецца ў сабак, лісоў, пяскоў, норак, ваўкоў, катоў, рыб, ракаў і інш. Для чалавека небяспечная чума вярблюда (зоаантрапанозная чума).

Крыніца інфекцыі — хворыя і перахварэлыя жывёлы; узбуджальнік выдзяляецца са слінай, калам, мачой і інш., перадаецца рэспіраторным, палавым і аліментарным шляхамі. Праяўляецца ліхаманкай, пашкоджаннямі страўнікава-кішачнага тракту, запаленнем лёгкіх і слізістых абалонак, сутаргамі, паралічам і інш. Меры барацьбы і прафілактыкі: апавяшчэнне, *каранцін*, *санітарная ахова граніц*, забой хворых жывёл, спальванне трупаў, дэзінфекцыя, вакцынацыя. *Т.У.Шэндрык.*

ЧУМА́ ЧАЛАВЕ́КА, прыродна-ачаговая інфекцыйная хвароба, якая адносіцца да *антрапазааноза́ў*. *Каранці́нная хвароба*. На Беларусі прыродных ачагоў Ч. няма, але магчымы завоз з-за мяжы.

Узбуджальнік — палачка Ч. (Yersinia pestis). Здаровыя людзі заражаюцца пераважна праз блох, якія паразітавалі на хворай жывёле, таксама паветрана-кропельным і аліментарным шляхамі. Інкубацыйны перыяд 3—6 дзён. Формы Ч. — скурная, бубонная, лёгачная, септычная. Агульныя сімптомы інтаксікацыі пры розных яе формах — мышачны і моцны галаўны боль, агульная слабасць, ірвота, высокая т-ра цела (39—40 °С), парушэнне свядомасці. Лакальныя сімптомы праяўляюцца ў залежнасці ад формы Ч.: пры скурнай утвараюцца язвы, укрытыя цёмным струпам; пры бубоннай (80—90% усіх выпадкаў захворвання Ч.) лімфатычныя вузлы павялічваюцца і спайваюцца з навакольнымі тканкамі. Самыя цяжкія формы Ч. — септычная і лёгачная. Лячэнне тэрапеўт., прафілактыка — папярэджанне завозу Ч. з-за мяжы (гл. *Санітарная ахова граніц*).

А.А.Астапаў.

ЧУМА́К Людміла Мікалаеўна (н. 15.5.1950, в. Крамяніца Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. моваznавец. Д-р філал. н. (1998). Скончыла Гродзенскі пед. ін-т (1971). Настаўнічала. З 1977 выкладае ў БДУ (з 1994 заг. кафедры). Даследуе праблемы сінтаксісу сучаснай рус. мовы, рус. мовы як замежнай, лінгвакультуралогіі, сацыялінгвістыкі. Аўтар манаграфій «Сінтаксіс рускай і беларускай моў у аспекце культуралогіі» (1997), «Супастаўляльнае лінгвакультуразнаўства: прынцыпы, метады, слоўнікі» (2003), навуч. дапаможнікаў «Руская мова ў тэстах і каментарыях: Сінтаксіс. Пунктуацыя» (2001, у сааўт.), «Сінтаксіс. Курс лекцый» (2003), і інш.

ЧУМАКІ́, другая назва возера *Цімошышчы* ў Калінкавіцкім р-не Гомельскай вобл.

ЧУМАКІ́, сацыяльная група насельніцтва, пераважна збяднелыя наёмныя сяляне, якія вазілі соль, салёную і сушаную рыбу з Крыма, Дона, а таксама з Прусіі і Закарпацця. Туды везлі хлеб, сала, скуры. Чумацкі промысел існаваў на Украіне і часткова на Беларусі ў 16 — 1-й пал. 19 ст. (са з'яўленнем чыгунак паступова знік). Жыццё і побыт Ч. адлюстраваны ў *чумацкіх песнях*.

Г.А.Пятроўская.

ЧУМАКО́Ў Аляксандр Мікітавіч (н. 14.3.1948, Мінск), бел. фізік. Канд. фіз.-матэм. н. (1981). Скончыў БДУ (1971). З 1971 у Ін-це фізікі, з 1992 у Ін-це малекулярнай і атамнай фізікі Нац. АН

Беларусі. Навук. працы па ўзаемадзеянні лазернага выпрамянення з рэчывам, дыягностыцы плазмы, радыяцыйнай плазмадынаміцы. Устанавіў эразійную прыроду ініцыравання імпульсных прыпаверхневых аптычных разрадаў у газах, прапанаваў эфектыўныя спосабы генерацыі лазернай эразійнай плазмы. Дзярж. прэмія Беларусі 1992.

Тв.: Спектроскопические исследования импульсных лазерных приповерхностных плазменных образований и волн поглощения (разам з Л.Я.Мінько, А.А.Бакеевым) // Журн. прикладной спектроскопии. 1989. Т. 51, № 3; Многоимпульсный приповерхностный оптический разряд как эффективный источник эрозионной плазмы (разам з М.А.Босакам) // Publ. Astron. Obs. Belgrade, 1998. № 61.

ЧУМАКО́Ў Аляксандр Пятровіч (н. 26.11.1941, с. Ільінка Дубаўскага р-на Растоўскай вобл., Расія), бел. ваен. дзеяч. Ген.-палк. (1997). Скончыў Адэскае ваен. агульнавайск. камандное вучылішча (1962), ваен. акадэміі імя Фрунзе (1970) і Генштаба (1980). З 1962 на камандных і штабных пасадах у Адэскай, Закаўказскай, Бел. ваен. акругах (1980—86). З 1986 у Групе сав. войск у Германіі. З 1988 нач. штаба — 1-ы нам. камандуючага войскамі БВА. У 1991—94 старшы групы ваен. спецыялістаў Рас. Федэрацыі ў КНДР, у Прыднястроўскім рэгіёне Рэспублікі Малдова. З 1995 нач. Гал. штаба — 1-ы нам. міністра абароны Рэспублікі Беларусь, з 1996 в.а. міністра абароны, са студз. 1997 да сак. 2001 міністр абароны Рэспублікі Беларусь.

ЧУМА́ЦКІЯ ПЕ́СНІ, сацыяльна-бытавыя пазаабрадавыя нар. песні. Узніклі ў асяроддзі *чумакоў*. У Ч.п. адлюстравана нялёгкая праца чумакоў, іх спецыфічны побыт у час працяглага адрыву ад дому, узаемаадносіны ў арцелях, пратэст супраць эксплуатацыі і сац. няроўнасці, а таксама ўзаемаадносіны з сям'ёй і інш. Найб. захавалася бел. Ч.п. пра горкую долю, хваробу, смерць і пахаванне чумака на чужыне, развітанне з сям'ёй ці каханай дзяўчынай, пра каханне. Для Ч.п. характэрны глыбокі псіхалагізм, тонкасць у перадачы пачуццяў, сімволіка. Большасць з іх сумныя; былі і вясёлыя песні. Бытавалі ў сял. асяроддзі як бяседныя, застольныя.

Літ.: Гринблат М.Я. Белорусы. Мн., 1968; Беларуская народна-паэтычная творчасць. Мн., 1979; Петровская Г.А. Белорусские социально-бытовые песни. Мн., 1982. *Г.А.Пятроўская.*

ЧУМІ́ЗА, мяшэй італьянскі, проса італьянскае (Setaria italica convar. maxima), кветкавая расліна сям. метлюжковых (злакавых). Шматлікія культ. разнавіднасці *мяшэю* італьян. падзяляюць на 2 групы: Ч. (крупяныя сарты) і *магар* (пераважна кармавыя сарты). Вядомы з 3 ст. да н.э. Культывуюцца ў краінах з умераным і субтрапічным кліматам. Як заносная Ч. трапляецца ў пасевах пшаніцы, люцэрны, лёну, асабліва проса.

1 2

Чуміза (1); 2 — магар.

Аднагадовая травяністая расліна выш. ад 25 см да 2 м. Лісце шырокаланцэтнае, завостранае, даўж. 25—65 см. Суквецце — коласападобная мяцёлка. Плод — зярняўка. Харч. (крупы, мука) і кармавая (фуражнае зерне, сена, зялёная маса) расліна. *В.М.Прохараў.*

«ЧУ́МНЫ БУНТ», паўстанне ў Маскве ў вер. 1771 у час эпідэміі чумы. Малаэфектыўныя проціэпідэмічныя захады ўлад (прымусовыя каранціны, знішчэнне заражанай асабістай маёмасці) выклікалі неразуменне, страх і незадаволенасць насельніцтва. Каб прадухіліць новую ўспышку масавага заражэння, маскоўскі архіепіскап Амбросій спрабаваў з дапамогай вайск. каманды перашкодзіць шматтысячным натоўпам збірацца каля «цудатворнага» абраза Варварскай брамы. У адказ 26 вер. пачалося паўстанне рамеснікаў, рабочых мануфактур, дваровых людзей, аброчных сялян і інш.: разгромлены каранцінныя заставы, забіты Амбросій. «Ч.б.» падаўлены войскамі: 4 чал. павешаны, 173 пакараны бізунамі і асланы на катаргу.

ЧУ́НА (у вярхоўях наз. У д а), рака ў Іркуцкай вобл. і Краснаярскім краі Расіі, правая складаючая р. Тасеева (бас. р. Енісей). Даўж. 1203 км, пл. бас. 56,8 тыс. км^2. Пачынаецца ва Усх. Саяне, у вярхоўі цячэ ў вузкай міжгорнай даліне, ніжэй — па Сярэднесібірскім пласкагор'і, перасякае трапы, утварае парогі. Ледастаў з канца кастр.—ліст. да канца крас.—мая. Сярэдні расход вады 300 м^3/с. У сярэднім цячэнні мясц. суднаходства. Сплаўная. На рацэ г. Ніжнядзінск.

ЧУНАТУ́НДРА, горны масіў на Кольскім п-ве (Расія), на З ад воз. Імандра. Выш. да 1114 м (г. Эбручор). Схілы ўкрыты лесам, на плоскіх вяршынях камяністая тундра. У межах Ч. — *Лапландскі запаведнік.*

ЧУНІ́ХІН Сяргей Антонавіч (21.9.1905, г. Харкаў, Украіна — 29.10.1985), бел. матэматык. Акад. Нац. АН Беларусі (1966, чл.-кар. 1956). Д-р фіз.-матэм. н. (1936), праф. (1934). Засл. дз. нав. Беларусі (1968). Скончыў Маскоўскі ун-т (1929). З 1930 у ВНУ Тулы, Масквы, Томска. З 1953 заг. кафедры Бел. ін-та інжынераў чыг. транспарту (Гомель). З 1960 у Гомельскім аддз. Ін-та матэматыкі АН Беларусі (заг. лабараторыі, адначасова з 1978 нам. дырэктара). Навук. працы па тэорыі канечных груп. Пабудаваў агульную тэорыю фактарызацыі канечных груп. Развіў новыя метады даследавання канечных груп, пры дапамозе якіх атрымаў найб. агульныя вынікі аб існаванні падгруп зададзенага ты-

С.А.Чуніхін.

М.М.Чуркін.

пу. Паказаў магчымасць новых дастасаванняў мінім. ненільпатэнтных груп (груп Шміта).

Тв.: Подгруппы конечных групп. Мн., 1964; Конечные группы (разам з Л.А.Шамяткоўым) // Алгебра. Топология. Геометрия, 1969. Мн., 1971; К теории индексиалов конечных групп // Исследование нормального и подгруппового строения конечных групп. Мн., 1984.

ЧУНЦЫ́Н, Юйчэн, Басянь, горад на ПдЗ Кітая, у прав. Сычуань, пры ўпадзенні р. Цзялінцзян у р. Янцзы. Узнік больш за 3 тыс. г. назад. 6,6 млн. ж. (2000). Трансп. вузел. Рачны порт. Буйны прамысл. цэнтр. Прам-сць: чорная металургія, прыладабудаванне, хім., гумавая, нафтаперапр., тэкст., харч.; выт-сць прамысл. абсталявання, будматэрыялаў. 2 ЦЭС, каскад ГЭС. Ун-т. У 1937—46 часовая сталіца Кітая. Паблізу ад Ч. здабыча каменнага вугалю.

ЧУПРО́Ў Аляксандр Іванавіч (18.2.1842, г. Масальск Калужскай вобл., Расія — 8.3.1908), расійскі эканаміст, публіцыст, адзін з заснавальнікаў рас. стат. навукі, у т.л. чыг. статыстыкі і эканомікі транспарту. Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1887). Скончыў Маскоўскі ун-т (1866). З 1874 выкладаў у ім. У 1869 арганізаваў Т-ва пашырэння тэхн. ведаў, у 1882 — Стат. аддз. пры Маскоўскім юрыд. т-ве (з 1883 яго старшыня). Удзельнічаў у распрацоўцы плана перапісу Масквы 1882 і ў яго ажыццяўленні. Узначальваў ліберальна-народніцкую плынь у эканам. тэорыі, прадстаўнікі якой прызнавалі неабходнасць частковых агр. пераўтва-

рэнняў (паляпшэнне культуры земляробства, арганізацыя саматужных арцеляў і перасяленняў) разам з захаваннем памешчыцкага землеўладання і сял. абшчыны. Аўтар падручнікаў па статыстыцы, прац па палітэканоміі, агр. пытаннях, чыг. гаспадарцы («Чыгуначная гаспадарка», т. 1—2, 1875—78; «Пра характар і прычыны сучаснага прамысловага крызісу ў Заходняй Еўропе», 1889; «Пра эканамічнае значэнне адукацыйных і выхаваўчых устаноў для рабочага класа», 1898, і інш.). Адзін з рэдактараў і аўтараў зб. «Уплыў ураджаяў і хлебных цэн на некаторыя бакі рускай народнай гаспадаркі» (1897). *Н.К.Мазоўка.*

ЧУПРЫ́ГІНА Людміла Трафімаўна (н. 20.5.1938, в. Прусы Капыльскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне інфарматыкі. Скончыла БДУ (1960). З 1960 у НДІ ЭВМ (у 1974—94 нач. аддзела). Навук. працы па сістэмным праграмным забеспячэнні ЭВМ, аперацыйных сістэмах ДОС і ОС для ЭВМ Адзінай сістэмы. Кіраўнік распрацоўкі праграмнага забеспячэння сістэмы раздзялення часу, дысплейных комплексаў ЕС 7920, «Сегмент», «Эдэльвейс». Дзярж. прэмія СССР 1978. *М.П.Савік.*

ЧУР Мікалай Мікалаевіч (н. 19.8.1948, г. Вілейка Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне хірургіі. Д-р мед. н. (1999). Скончыў Віцебскі мед. ун-т (1972). З 1975 у Мінскай абл. клінічнай бальніцы. З 1995 у Бел. мед. акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Асн. навук. працы па лячэнні хворых з сіндромам дыябетычнай ступні, малаінвазійных метадах лячэння астаткавых гнайнікоў брушной поласці.

Тв.: Обоснование путей улучшения результатов лечения синдрома диабетической стопы // Актуальные вопросы эндокринологии. Мн., 1999; Синдром диабетической стопы. Мн., 2000 (разам з І.М.Грышыным); Ранние послеоперационные осложнения прободных пилородуоденальных язв и их лечение (у сааўт.) // Третий конгресс Ассоциации хирургов им. Н.И.Пирогова. М., 2001.

ЧУРА́БА Мікалай Дзмітрыевіч (24.12.1913, Мінск — 29.1.1998), бел. мастак. Скончыў Маскоўскі маст. ін-т імя В.Сурыкава (1940). У 1966—82 выкладаў у Брэсцкім інж.-буд. ін-це. Працаваў у кніжнай і станковай графіцы, жывапісе. Творы адметныя грамадзянскасцю і патрыятызмам, дакладнасцю малюнка, гарманічным каларытам, выразнасцю пластычнай формы. Сярод графічных твораў: «Док рыбкалгаса. Ейск» (1937), трыпціх «Абарона Брэсцкай крэпасці» (1949), цыкл «Мой родны Брэст» (1958), «Я.Колас у дзяцінстве» (1959), партрэты герояў Брэсцкай крэпасці (1965). Аўтар жывапісных работ «Цаною жыцця» (1961), «У Брэсцкай крэпасці» (1964), «Руіны парахавога склада» (1969), трыпціх «На парозе бессмяротнасці» (1971), «Смага» (1979), «Зноў згушчаюцца хмары» (1983). Пісаў таксама партрэты («У сваёй майстэрні»), нацюрморты. Афарміў кнігі «Вершы для дзяцей» М.Лужаніна (1948), «Залаты карп» А.Стаховіча (1951), «Новая зямля» Я.Коласа (1958) і інш. *Л.Ф.Салавей.*

М.**Чураба**. У сваёй майстэрні.

ЧУ́РКІН Аскольд Мікалаевіч (27.1.1930, Мінск — 17.6.1985), бел. графік. Сын М.М.*Чуркіна*. Скончыў БДУ (1955). У 1959—73 маст. рэдактар час. «Вожык», у 1979—84 час. «Беларусь». Працаваў у кніжнай графіцы і плакаце. Аўтар карыкатур на быт., паліт., вытв. тэмы ў бел. і замежным перыяд. друку: «На адным заводзе» (1955), «Колькі галасоў атрымаў прэзідэнт?» (1957), «Графік гультая» (1958), «Дазвольце прыкурыць» (1962), «У нас сапраўдная дэмакратыя» (1966); плакатаў «25 гадоў СЭУ» (1974), «Агульны рынак», «Мы з вамі, патрыёты Чылі» (абодва 1976). Выдаў зб-кі карыкатур «Мае альбомы» (1967), «Твар свабоднага свету» (1983) і інш. *Л.Ф.Салавей.*

ЧУ́РКІН Мікалай Мікалаевіч (21.5.1869, г. Сцепанаван, Арменія — 27.12.1964), бел. кампазітар, фальклярыст; адзін з заснавальнікаў бел. прафес. музыкі. Нар. арт. Беларусі (1949). Скончыў Тбіліскае муз. вучылішча Рус. муз. т-ва (1892, кл. М.*Іпалітава-Іванава*), Пецярбургскую АМ (1899). З 1898 настаўнічаў, кіраваў аматарскімі хар. калектывамі ў Баку, з 1903 у Каўнасе, з 1905 у Вільні. З 1924 на Беларусі, працаваў педагогам настаўніцкай семінарыі, агульнаадук. школ, заг. муз. падсекцыі павятовага выканкома, арганізатарам маст. самадзейнасці ў г. Мсціслаў. З 1924 выкладчык пед. тэхнікума ў Магілёве, з 1935 у Мінску. Яго музыка адметная аптымізмам, строгай класічнай формай, меладычнасцю, апорай на бел. муз. фальклор. Збіраў муз. фальклор (запісаў больш за 3000 бел., груз., арм., азерб., польскіх, літ., тадж. песень і танцаў). Сярод твораў: оперы «Вызваленне працы» (паст. 1922), «Раскіданае гняздо» паводле Я.Купалы (клавір, 1959—64), радыёопера для дзяцей «Рукавічка» (паст. 1948); муз. камедыі «Кок-сагыз» (паст. 1939), «Песня Бярэзіны» (паст. 1947); 3 сімфаньеты (1925, «Беларускія карцінкі»; 1949, 1955), увертюра «Памяці Янкі Купалы» (1952) для арк. бел. нар. інструментаў, сюіты для сімф. і нар. аркестраў, 11 стр. квартэтаў, хары, рамансы, песні для дзяцей на словы бел. паэтаў, музыка да драм. спектакляў. Апрацоўваў нар. песні і танцы (53 бел. нар. мелодыі ў яго запісе і апрацоўцы змешчаны ў «Беларускім зборніку» Е.Раманава, вып. 7, 1910). Складальнік зб-каў «Беларускія народныя песні і танцы» (1949) і «Беларускія народныя песні» (1959).

Літ.: Журавлев Д.Н. Большая дорога: Народный артист БССР Н.Н.Чуркин. Мн., 1964. *Дэ.М.Жураўлёў.*

ЧУРКО́ Леанард Васілевіч (10.6.1931, Мінск — 26.2.1983), бел. графік. Скончыў Маскоўскі паліграф. ін-т (1962). Працаваў у станковай, кніжнай, прамысл. графіцы, плакаце. Творы вылучаюцца дакладнасцю кампазіцыі, вострахарактарнасцю вобразаў: лісты «Літоўка», «Рыбны порт», «Клайпеда. Стары дворык» (усе 1966), «Трывога» (1967), «Мінск пасля дажджу», «Браслаў», «Новалукомль» (усе 1969), «Калгас «Новы быт» (1970); карыкатуры «Набіваюць цану» (1963), «Заатэхнік» (1964), «Узаемнае віншаванне» (1965) і інш. Афарміў кнігі «Школьны каляндар прыроды» А.Курскова (1969), «Клятва» М.Гелавані (1970), «А дзе ж тая крынічанька» (1972) і «Як я вучыўся жыць» (1974) Н.Гілевіча, «Беларускі народны танец» Ю.Чурко (1972), «Шчырасць» А.Лойкі, «Грыбная пара» А.Грачанікава (абедзве 1973) і інш. *Л.Ф.Салавей.*

ЧУРКО́ Юлія Міхайлаўна (н. 21.7.1936, С.-Пецярбург), бел. балерына, мастац-

Л.**Чурко**. Агітплакат. 1971.

твазнавец, педагог. Засл. дз. маст. Беларусі (1991). Д-р мастацтвазнаўства (1972). Праф. (1974). Скончыла Бел. харэаграфічнае вучылішча (1954), БДУ (1960). У 1954—61 салістка Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. З 1963 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, выкладчык Бел. кансерваторыі, з 1972 заг. кафедры Мінскага пед. ін-та, з 1979 Бел. ін-та культуры (да 1995), адначасова з 1994 у Бел. акадэміі музыкі (з 1995 заг. кафедры). Сярод выкананых партый: Гамзаці («Баядэрка» Л.Мінкуса), Насця («Падстаўная нявеста» Г.Вагнера) і інш. Працы па гісторыі і тэорыі бел. харэаграфіі, нар. танца: «Беларускі балет» (1966), «Беларускі сцэнічны танец» (1969), «Беларускі народны танец» (1972), «Беларускі балетны тэатр» (1983), «Беларускі балет у асобах» (1988), «Беларускі харэаграфічны фальклор» (1990), «Лінія, што ідзе ў бясконцасць» (1999), сааўтар кніг «Музычны тэатр Беларусі, 1917—1959» (1993), «Музычны тэатр Беларусі,1960—1990: Балет...» (1997). Аўтар лібрэта да балетаў «Мефіста» У.Кандрусевіча і «Кругаверць» А.Залётнева (адначасова адзін з пастаноўшчыкаў) і інш. Арганізатар і кіраўнік н.-д. лабараторыі танц. творчасці пры Мінскім ін-це культуры (1980—90). Аўтар сцэнарыяў, у т.л. дакумент. тэлефільмаў, вядучая тэлерадач пра мастацтва танца. Дзярж. прэмія Беларусі 1998.

Літ.: Ю.М.Чурко: Бібліягр. паказ. Мн., 1998.

ЧУРЛЁНІС (Čiurlionis) Мікалоюс Канстанцінас (22.9.1875, г. Варэна, Літва — 10.4.1911), літоўскі жывапісец і кампазітар; прадстаўнік сімвалізму. Вучыўся ў рысавальнай школе Я.Каўзіка (1902—05) і маст. вучылішчы (1905) у Варшаве. Вывучаў музыку ў Варшаўскім муз. ін-це (1894—99) і Лейпцыгскай кансерваторыі (1901—02). Чл. аб'яднання «Свет мастацтваў» (1911). У аснове яго твораў «нар. рамантыка» літоўскага фальклору, у позні перыяд прасочваюцца аналогіі музыкі і выяўл. мастацтва. Творчая манера вылучаецца своеасаблівай абагульненасцю, вытанчаным каларытам: жывапісныя кампазіцыі «Саната вясны», «Саната сонца» (абодва 1907), «Саната мора», «Саната зорак» (абодва 1908), трыпціх «Казка» (1907), цыклы «Стварэнне свету» (1904—06), «Казка каралёў», «Знакі задыяка», «Вясна», «Зіма» (усе 1907), «Жэмайскія крыжы» (1909).

Да арт. **Чурыгера**. Х.Б. дэ Чурыгера. Рэтабла касцёла Сан-Эстэбан у г. Саламанка. 1693—96.

М.К.**Чурлёніс**. Саната зорак. 1908.

М.К.**Чурлёніс**.

Муз. творчасць Ч. адносіцца да неарамантызму, звязана з літ. фальклорам. Аўтар першых літ. сімф. паэм («У лесе», 1900; «Мора», 1907), стр. квартэта, больш як 200 твораў для фп. і інш. Запісваў і гарманізаваў мелодыі літ. нар. песень. З 1965 у Літве праводзіцца конкурс выканаўцаў імя Ч. (з 1991 міжнар.). Мемар. музеі ў гарадах Каўнас і Друскінінкай.

Літ.: Чюрлените Я.К. Воспоминания о М.К.Чюрленисе: Пер. с лит. Вильнюс, 1975; Ландсбергис В.В. Творчество Чюрлениса. 2 изд. Л., 1975.

ЧУРСІНА́ Людміла Аляксееўна (н. 20.7.1941, Душанбе), расійская актрыса. Нар. арт. СССР (1981). Скончыла Тэатр. вучылішча імя Б.Шчукіна (1965). З 1963 у Т-ры імя Я.Вахтангава, у Т-ры-студыі кінаакцёра пры кінастудыі «Ленфільм», з 1974 у Ленінградскім т-ры драмы імя А.Пушкіна, з 1984 у Цэнтр. т-ры Рас. Арміі. Яе творчай манеры ўласціва імкненне да стварэння складаных вобразаў, паказу развіцця характару ў барацьбе з сабой і знешнімі абставінамі: Ліза («Дзеці сонца» М.Горкага), Саша («Іванаў» А.Чэхава), Настасся Піліпаўна («Ідыёт» паводле Ф.Дастаеўскага), імператрыца Марыя Фёдараўна («Павел I» Дз.Мережкоўскага), лэдзі Макбет («Макбет» У.Шэкспіра). З 1961 здымаецца ў кіно: «Данская аповесць» (1965), «Угрумрака» (тэлефільм), «Журавушка» (прыз Міжнар. кінафестывалю ў Сан-Себасцьяне), «Вірынея» (усе 1969), «Любоў Яравая» (1970, прыз Міжнар. кінафестывалю ў Карлавых Варах), «Алеся» (1971), «Прывалаўскія мільёны» (1973), «І гэта ўсё пра яго» (1977, тэлефільм), «Факты мінулага дня» (1981), «Каханне немаладога чалавека» (1990), «Графіня», «Справа Сухаво-Кабыліна» (абодва 1991), «Хагіпрагер» (1994), «Чорны пакой» (2000, тэлесерыял) і інш. Дзярж. прэмія Расіі 1970.

Літ.: Актеры советского кино. Вып. 7. М., 1971.

ЧУРЫГЕ́РА (de Churriguera), іспанскія архітэктары і скульптары 17—18 ст.; браты. Хасэ Беніта дэ Ч. (21.3.1665, Мадрыд — 2.3.1725) у пабудовах, алтарных кампазіцыях і алтарах-рэтабла спалучаў прыёмы барока з матывамі готыкі і платэрэска, ужываў мудрагелістую арнаментыку, выгнутыя хвалепадобныя карнізы, калоны, пышны скульпт. дэкор: рэтабла касцёла Сан-Эстэбан у г. Саламанка (1693—96), палац у Мадрыдзе (пасля 1689, перабудаваны ў 1774; цяпер Каралеўская акадэмія прыгожых мастацтваў Сан-Фернанда), план г. Нуэва-Бастан з палацам, касцёлам і фабрыкай (1709—13). Яго імем названы ісп. варыянт барока 17—18 ст. — стыль чурыгерэска. У Саламанцы працавалі таксама Хаакін (1674—1724) і Альберта (1676—1740).

ЧУ́РЫКАВА Іна Міхайлаўна (н. 5.10.1943, г. Белебей, Башкортастан), расійская актрыса. Нар. арт. СССР (1991). Скончыла Тэатр. вучылішча імя М.Шчэпкіна (1965). У 1965—68 у Маскоўскім т-ры юнага гледача. З 1973 у т-ры «Ленком». Яе мастацтву ўласцівы спалучэнне драм. і камед., лірычнага і эксцэнтрычнага пачаткаў, схільнасць да вострасюжэтнай трактоўкі вобразаў класічнай драматургіі: Сара, Аркадзіна («Іванаў», «Чайка» А.Чэхава), Афелія («Гамлет» У.Шэкспіра), Бабуленька («Варвар і ератык» паводле рамана Ф.Дастаеўскага «Гулец»), Філумена («Горад мільянераў» паводле п'есы Э.Дэ Філіпа «Філумена Мартурана»). З 1961 здымаецца ў кіно: «Хмары над Борскам» (1961), «У агні броду няма» (1968), «Пачатак» (1970), «Прашу слова» (1976), «Той самы Мюнхгаўзен» (1979, тэлефільм), «Тэма» (1979, вып. 1987), «Валянціна» (1981),

«Васа» (1983), «Ваенна-палявы раман» (1984, прыз Міжнар. кінафестывалю ў Зах. Берліне), «Рабро Адама», «Маці» (абодва 1990), «Год сабакі», «Курачка Раба» (абодва 1994), «Шырлі-мырлі» (1995) і інш. Дзярж. прэміі Расіі 1985, 1996.

Літ.: Гербер А. Судьба и тема. М., 1985.

ЧУРЫ́ЛА Уладзімір Усеваладавіч (н. 16.12.1950, Масква), бел. мастак. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1976). Працуе ў манум.-дэкар. мастацтве, маст. праектаванні, станковым жывапісе. Аўтар маст. афармлення станцый Мінскага метрапалітэна «Акадэмія навук» (1979—84), «Плошча Я.Коласа» (1980—81), «Пушкінская» (1997); Палаца культуры з-да «Оптык» у г. Ліда Гродзенскай вобл. (1985), Нац. цэнтра творчасці дзяцей і моладзі (1990—96), залаў прыёмаў Дома ўрада Беларусі (1993—98), рэзідэнцыі пасла Турцыі (1999), салона «Пасольства прыгажосці» (2001) у Мінску; жывапісных кампазіцый «Нацюрморт з хурмой», «Пеўні» (абедзве 2000), серыі «Палескія замалёўкі» (2002) і інш. *Л.Ф.Салавей.*

ЧУРЫ́ЛАВА, возера ў Міёрскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Мёрыца, каля в. Чурылава, за 8 км на ПнУ ад г. Міёры. Пл. 0,2 км^2, даўж. 920 м, найб. шыр. 250 м, найб. глыб. 14,4 м, даўж. берагавой лініі 2,38 км. Пл. вадазбору 2 км^2. Катлавіна лагчыннага тыпу, выцягнутая з ПнУ на ПдЗ, яе схілы выш. 4—6 м, спадзістыя, пад с.-г. ўгоддзямі, на ПдУ пад лесам. Берагі высокія, пад хмызняком. Дно да глыб. 2 м пясчанае, ніжэй ілістае. Вада вызначаецца нізкай мінералізацыяй і празрыстасцю. Зарастае амаль трэць плошчы возера да глыб. 2 м.

ЧУРЫ́ЛАВІЦКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА. У Мінскім р-не каля в. Чурылавічы, за 20 км на Пд ад Мінска. Створана ў 1982. Пл. 0,34 км^2, даўж. 660 м, найб. шыр. 580 м, найб. глыб. 7,1 м. Аб'ём вады 1,3 млн. м^3. Сярэднегадавы сцёк 44,8 млн. м^3. Чаша вадасховішча — пойма р. Піч, агароджаная з двух бакоў дамбамі даўж. 730 м і 1,37 км. Ваганні ўзроўню вады на працягу года да 4 м. Выкарыстоўваецца для рэгулявання воднага рэжыму зямель і рыбагадоўлі.

ЧУФА́, земляны міндаль, сыць ядомая (Cyperus esculentus), кветкавая расліна сям. асаковых. Радзіма — Афрыка. Пашырана ў тропіках і субтропіках, культывуецца як алейная расліна пераважна ў Міжземнамор'і. Вядома ў культуры Стараж. Егіпта з 3-га тыс. да н.э. На Беларусі вырошчваюць на прысядзібных участках.

Шматгадовая (у культуры аднагадовая) травяністая расліна выш. 20—60 см. У 1-ы год вегетацыі фарміруе да 240 пучкоў лінейнага вузкага лісця (па 3—12 у пучках) і каля 400 падземных парасткаў з клубеньчыкамі (да 1000 на адной расліне). Кветкі дробныя, у пазухах верхняга лісця, сабраныя ў парасонападобнае суквецце. Плод — арэшак. Клубні маюць крухмал (30—35%), тлусты алей (да 25%), цукры (15—20%), бялкі (3—7%). Спажываюць у ежу, з іх атрымліваюць харч. алей, выкарыстоўваюць у кандытарскай прам-сці, зялёная маса ідзе на корм жывёле. Харч., тэхн., кармавая расліна. *В.М.Прохараў.*

ЧУХАДЖА́Н Тыгран Геворгавіч (1837, г. Стамбул, Турцыя — 23.3.1898), армянскі кампазітар, дырыжор, педагог і муз.-грамадскі дзеяч. Жыў у Канстанцінопалі. Заснавальнік першых муз.-тэатр. трупаў у зах. Арменіі, Турцыі і на Б. Усходзе. З 1878 узначальваў муз.-тэатр. трупу ў Канстанцінопалі. Аўтар першай арм. оперы «Аршак II» (1868, паст. 1945), оперы-феерыі «Земірэ» (паст. 1893), камічнай оперы «Арыф» (на сюжэт «Рэвізора» М.Гогаля, паст. 1872), аперэт «Пляшывы староста» (паст. 1873), «Леблебіджы» («Прадавец гароху», паст. 1875) і інш. Яго творы адметныя сінтэзам усх. і еўрап. муз. традыцый.

ЧУХНО́ЎСКІ Барыс Рыгоравіч (9.4.1898, С.-Пецярбург — 30.9.1975), палярны лётчык. Скончыў школу марскіх лётчыкаў у Араніенбаўме. У 1924 здзейсніў адзін з першых палётаў на Новую Зямлю (пасля Я.І.*Нагурскага*, гл. Дадатак) з мэтай гідраграфічных работ і праводкі суднаў Карскай экспедыцыі. Удзельнічаў у пошуках экспедыцыі У.*Нобіле* (1928), у лядовай разведцы Паўн. марскога шляху (1929—32), пошуках самалёта С.А.*Леванеўскага* (1937—38). Сканструяваў з Р.Л.Барціні самалёт ДАР (далёкі арктычны разведчык, 1933—36). У Вял. Айч. вайну ўдзельнічаў у баях Паўн. флоту. Пасля вайны ў палярнай авіяцыі Галоўпаўночмаршляху.

Літ.: Виноградов С.Ф. В дерзновенном полете. М., 1975. *І.А.Шор.*

ЧУХО́НЦАЎ Алег Рыгоравіч (н. 8.3.1938, г. Паўлаўскі Пасад Маскоўскай вобл.), рускі паэт. Скончыў Маскоўскі абл. пед. ін-т (1962). Друкуецца з 1958. У паэт. зб-ках «З трох сшыткаў» (1976), «Ветрам і попелам» (1989), аповесці ў вершах «З аднолькавым прозвішчам» (1987) і інш. вастрыня бачання калізій сучаснага быцця, драм. перажыванне сав. і сучаснай рэчаіснасці. Перакладае на рус. мову П.Верлена, Дж.Кітса, І.В.Гётэ і інш. Дзярж. прэмія Расіі 1993.

Тв.: Пробегающий пейзаж. М., 1997.

ЧУХРА́Й Рыгор Навумавіч (23.5.1921, г. Мелітопаль Запарожскай вобл., Украіна — 29.10.2001), расійскі кінарэжысёр. Нар. арт. Расіі (1969). Нар. арт. СССР (1981). Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1953), у 1966—71 выкладаў у ім. У 1965—75 маст. кіраўнік Эксперым. творчага аб'яднання пры кінастудыі «Масфільм». Першы фільм — «Сорак першы» (1956, спец. прыз Міжнар. кінафестывалю ў Кане, 1957). Фільмам уласцівы лірызм, тонкі псіхалагізм, сац.-маральная праблематыка: «Балада пра салдата» (1959, прыз Міжнар. кінафестывалю ў Кане; гал. прыз Усесаюзнага кінафестывалю, 1960), «Чыстае неба» (1961, гал. прыз Міжнар. кінафестывалю ў Маскве), «Жылі-былі стары са старою» (1965), «Памяць» (1971), «Жыццё цудоўнае» (1980), «Я навучу вас марыць» (1984, з Ю.Швыровым) і інш. Ленінская прэмія 1961.

Літ.: Зоркая Н. Портреты. М., 1966.

У.Чурыла. Размалёўка «Чароўныя рытмы» ў Нацыянальным цэнтры творчасці дзяцей і моладзі. 1996.

ЧУ́ЦІКАЎ Яфрэм Сямёнавіч (?, г. Шклоў Магілёўскай вобл. — 20.6.1841), бел. і рускі артыст балета. З 1780-х г. прыгонны танцоўшчык *Шклоўскага тэатра Зорыча*. З 1800 характарны танцоўшчык балетнай трупы Пецярбургскага імператарскага т-ра. Сярод партый: Фурыя Шаленства («Медэя і Ясон», муз. Ж.Радольфа, паст. Ш.Дзідло), Скараход («Чароўная флейта»; абодва 1822). У 1822 адпушчаны на волю.

ЧУЧКО́ Валерый Аляксандравіч (н. 14.3.1939, Мінск), бел. вучоны ў галіне судова-мед. экспертызы. Д-р мед. н. (1992), праф. (1994). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1962). З 1964 у Гродзенскім мед. ін-це. Гал. судова-мед. эксперт Мін-ва аховы здароўя Беларусі (1978). З 1985 у Мінскім мед. ін-це. Навук. пра-

цы па функцыян. і марфал. змяненнях пры аспірацыі харч. мас, асаблівасцях траўматызацыі пры падзенні з вышыні.

Тв.: Метематическое моделирование как метод для установления пассивного или активного падения с высоты // Материалы I съезда Белгосслужбы судебно-медицинской экспертизы. Мн., 2000; Судебно-медицинские аспекты механизма травматизации при падении из движущейся автомашины (разам з А.А.Сасноўскім) // Там жа; Дифференциальная диагностика механизма травматизации тела при падении с высоты и из движущейся автомашины // Актуальные вопросы современной медицины. Мн., 2001. Ч. 2.

ЧУЯШО́Ў Віктар Іванавіч (н. 7.6.1955, г. Полацк Віцебскай вобл.), бел. філосаф. Д-р філас. н. (1993), праф. (1996). Скончыў Ленінградскі ун-т (1977). З 1981 у Хабараўскім ін-це нар. гаспадаркі. З 1984 у Віцебскім тэхнал. ун-це (з 1994 заг. кафедры). З 2002 заг. кафедры Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Навук. працы па праблемах логікі, рыторыкі, філасофіі палітыкі, гісторыі філасофіі. Распрацаваў прынцыпы і катэгарыяльны апарат аргументалогіі як сучаснай шматузроўневай філасофіі тэорыі і практыкі аргументацыі, раскрыў спосабы яе выкарыстання ў сферах палітыкі і эканомікі.

Тв.: Философия, риторика, аргументация. СПб., 1992; Введение в современную философию. 2 изд. Мн., 1998; Логика и основы психологии. Витебск, 1999; Риторика рыночного дискурса // Философия в современном мире. Мн., 2001; Философия экономики и антропологические миры // Онтология возможных миров. СПб., 2002; Основы современной логики. Мн., 2003.

ЧХАНДЖЫ́Н, Ч х а н ч ж ы н, горад на ПнУ КНДР, адм. цэнтр прав. Хамгён-Пукто. 520 тыс. ж. (1987). Трансп. вузел. Незамярзаючы порт на Японскім моры. Буйны ц. чорнай металургіі. Прам-сць: машынабудаванне (у т.л. судна-, станкабудаванне, вытв-сць горнага абсталявання, с.-г. машын), хім., тэкст., у т.л. штучны шоўк. Вытв-сць будматэрыялаў. Рыбалоўства.

ЧХА́НЕ, ахоўны безумоўнарэфлекторны выдых. Выклікаецца раздражненнем адчувальных нерв. канцоў слізістай абалонкі носа, здзяйсняецца пасля кароткага ўдыху з хуткім кароткачасовым скарачэннем дыхальнай мускулатуры і мышцаў глоткі. Паслядоўнасць рэакцый пры Ч. строга запраграміравана і запускаецца імпульсамі, што ідуць з дыхальнага цэнтра ствала мозга. З выдыхам з поласці носа выдаляецца пыл, слізь і інш. раздражняльныя рэчывы. Учашчанае Ч. з'яўляецца сімптомам захворванняў, што пашкоджваюць рэфлексагенную зону дадзенага рэфлексу (грып, катар, алергічныя захворванні верхніх дыхальных шляхоў). *А.С.Леанцюк.*

ЧХЕІ́ДЗЕ Мікалай (Карла) Сямёнавіч (1864, с. Путы Зестафонскага р-на, Грузія — 1926), расійскі і груз. паліт. дзеяч, адзін з лідэраў *меншавікоў*, журналіст. У с.-д. руху з канца 1890-х г. Дэп. 3-й (1907—12) і 4-й (1912—17) Дзярж. дум, старшыня меншавіцкай фракцыі ў 4-й Думе. У 1-ю сусв. вайну цэнтрыст, прыхільнік удзелу рабочых у ваенна-прамысловых камітэтах. Пасля Люг. рэвалюцыі 1917 чл. *Часовага камітэта Дзяржаўнай думы 1917*, старшыня Выканкома Петраградскага Савета і ВЦВК Саветаў 1-га склікання. Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 у Грузіі. У люг.—чэрв. 1918 старшыня *Закаўказскага сейма* з правамі прэзідэнта Закаўк. Дэмакр. Федэратыўнай Рэспублікі (распалася ў чэрв. 1918), з сак. 1919 старшыня Устаноўчага сходу (парламента) Груз. Дэмакр. Рэспублікі. З 1921 у эміграцыі (Францыя). Скончыў самагубствам.

ЧХЕІ́ДЗЕ Рэваз Давідавіч (н. 8.12.1926, Тбілісі), грузінскі кінарэжысёр. Нар. арт. СССР (1980). Скончыў Усерас. дзярж. ін-т кінематаграфіі (1953). З 1953 рэжысёр-пастаноўшчык, з 1974 дырэктар кінастудыі «Грузія-фільм». Паставіў фільмы: «Лурджа Магданы» (1955, з Т.Абуладзе; прэмія Міжнар. кінафестывалю ў Кане, 1956), «Наш двор» (1957), «Мая з Цхнеты» (1959), «Бацька салдата» (1965), «Ну і моладзь!» (1969), «Саджанцы» (1973), «Твой сын, зямля» (1981) і інш. Ленінская прэмія 1986 (у 1991 ад яе адмовіўся).

ЧХЕІ́ДЗЕ Ушангі Віктаравіч (27.11.1898 — 1.12.1953), грузінскі акцёр, драматург. Нар. арт. Грузіі (1935). Скончыў тэатр. студыю Г.Джабадары. З 1921 акцёр Т-ра імя Ш.Руставелі. У 1928 удзельнічаў у стварэнні т-ра ў Кутаісі (цяпер Т-р імя К.Марджанішвілі ў Тбілісі), працаваў у ім да 1935. Сярод роляў: Кварквараэ Тутаберы («Кварквараэ Тутаберы» П.Какабадзе), Чаліяні («Учарашнія» Ш.Дадыяні), Гамлет, Яга («Гамлет», «Атэла» У.Шэкспіра), Гадун («Разлом» Б.Лаўранёва). Здымаўся ў кіно. Аўтар гіст. драмы «Георгій Саакадзе» (паст. 1940), кніг «Катэ Марджанішвілі — рэжысёр і настаўнік» (1949), «Успаміны і пісьмы» (1956).

ЧХІКВА́ДЗЕ Рамаз Рыгоравіч (н. 28.2.1928, Тбілісі), грузінскі акцёр. Нар. арт. СССР (1981). Герой Сац. Працы (1988). Скончыў Тбіліскі тэатр. ін-т (1951). З 1951 у Т-ры імя Ш.Руставелі ў Тбілісі. Творчасці ўласцівы майстэрства імправізацыі і пераўтварэння. Сярод роляў: Кварквараэ Тутаберы («Кварквараэ Тутаберы» П.Какабадзе), Рычард III, кароль Лір («Рычард III», «Кароль Лір» У.Шэкспіра), Аздак («Каўказскі мелавы круг» Б.Брэхта). Здымаўся ў кіно: «Страказа», «Саджанцы», «На парозе жыцця», «Смерць філатэліста», «Старыя млыны», «Дрэва жадання», «Грузінская хроніка XIX стагоддзя», «Рукі ўверх!», «Шлях дадому», «Перамога» (роля І.Сталіна). Дзярж. прэміі Грузіі 1974, 1981, Дзярж. прэмія СССР 1979.

ЧЫБУРДАНІ́ДЗЕ Мая Рыгораўна (н. 17.1.1961, г. Кутаісі, Грузія), грузінская шахматыстка. Чэмпіёнка свету (1978—91), 6-я ў гісторыі шахмат. Міжнар. гросмайстар сярод жанчын (1977) і мужчын (1984). Засл. майстар спорту СССР (1978). Пераможца 5 шахматных алімпіяд (1978—86) у складзе зборнай каманды СССР. Чэмпіёнка СССР сярод дзяўчат (1976) і жанчын (1977). Пераможца і прызёр буйных міжнар. турніраў: у Тбілісі (1975, 1984), Будапешце (1978), Бялградзе (1979, 1983), г. Бад-Кісінген, Германія (1979), г. Яйцы, Югаславія (1986), Бруселі (1987). Уладальніца міжнар. шахматнага прыза «Оскар» (1984—87). *А.М.Петрыкаў.*

ЧЫ́ВЕР (Shever) Джон (27.5.1912, г. Куінсі, штат Масачусетс, ЗША — 19.6.1982), амерыканскі пісьменнік. Працаваў у перыяд. выданнях. Літ. дзейнасць пачаў у 1930-я г. псіхал. апавяданнямі. У дылогіі «Сямейная хроніка Уопшатаў» (1957) і «Скандал у сям'і Уопшатаў» (1964), сатыр. рамане «Булет-Парк» (1969), зб. апавяд. і навел «Гісторыі Джона Чывера» (1978), аповесці «Ну проста райскі куток» (1982) крызіс «грамадства спажывання», катастрафічныя сац. і маральныя тэндэнцыі ў амер. рэчаіснасці. Паэтыка Ч. адметная спалучэннем дакладнасці фактаў і дэталей, каларытнасці персанажаў, псіхалагізму з элементамі ўмоўнасці і прытчавасцю.

Тв.: Рус. пер. — Исполинское радио. М., 1962; Ангел на мосту. М., 1966; Прощай, брат. Л., 1983; Семейная хроника Уопшотов... М., 1983.

Літ.: Мендельсон М.О. Социально-критические мотивы в творчестве Беллоу, Апдайка и Чивера // Проблемы литературы США XX в. М., 1970; Олдридж Дж. Джон Чивер и облегченная форма трагедии // Олдридж Дж. После потерянного поколения: Пер. с англ. М., 1981. *Е.А.Лявонава.*

ЧЫВІЛІ́ХІН Уладзімір Аляксеевіч (7.3.1928, г. Марыінск Кемераўскай вобл., Расія — 9.6.1984), рускі пісьменнік. Скончыў Маскоўскі ун-т (1954). Першая кніга — дакумент. аповесць «Жывая сіла» (1957). Маральна-сац. праблемы ў аповесцях «Сярэбраныя рэйкі» (1959), «Пра Клаву Іванову» (1964), «Ёлкі-маталкі» (1965), «Над узроўнем мора» (1967) і інш. Тэма чалавека і прыроды ў кн. публіцыстычных нарысаў «Зямля ў бядзе» (1969), «Шведскія прыпынкі» (1974), «Па гарадах і вёсках» (1976). Раман-эсэ «Памяць» (кн. 1—2, 1978—81; Дзярж. прэмія СССР 1982) нетрадыцыйна трактуе некат. моманты рус. гісторыі ад 11 ст. да 1980-х г. Аўтар кн. «Вершы» (1974). Дзярж. прэмія Расіі 1977.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—4. М., 1985; Зеркало души. М., 1987; В нашем доме: Повести. Кемерово, 1987; Дорога: Из архива писателя. М., 1989.

Літ.: Сергованцев Н. В.Чивилихин. М., 1978.

ЧЫ́ГАРАЎ Анатоль Уласавіч (н. 2.12.1941, в. Жаркі Вохамскага р-на Кастрамской вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне тэа-

рэт. і прыкладной механікі. Д-р фіз.-матэм. н. (1987), праф. (1989). Чл. Нью-Йоркскай АН (1996). Віцэ-прэзідэнт Бел. т-ва тэарэт. і прыкладной механікі (1995). Брат Ю.У.*Чыгарава*. Скончыў Варонежскі ун-т (1967). З 1979 у Бел. нац. тэхн. ун-це (з 1991 заг. кафедры). Навук. працы па тэорыі распаўсюджвання хваль і пытаннях узнікнення дэтэрмінаванага хаосу і самаарганізацыі ў неаднародных асяроддзях; праблемах назапашвання пашкоджанняў, якія выклікаюць эфекты паўзучасці і рэлаксацыі ў гетэрагенных матэрыялах; па праектаванні шумавібраізаляцыйных матэрыялаў і канструкцый, некаторых пытаннях біямеханікі.

Тв.: Стохастическая и регулярная динамика неоднородных сред. Мн., 2000; Механика контактного взаимодействия тел с круговыми границами. Мн., 2000 (разам з А.С.Краўчуком); Теоретическая механика и методы математики. Мн., 2000 (разам з А.А.Фядутам, Ю.У.Чыгаравым); Биомеханика. Мн., 2003 (разам з Г.І.Міхасёвым). *А.І.Болсун.*

ЧЫГАРАЎ Юрый Уласавіч (н. 9.12.1944, г. Мурманск, Расія), бел. вучоны ў галіне тэарэт. і прыкладной механікі. Д-р фіз.-матэм. н. (1993), праф. (1994). Брат А.У.*Чыгарава*. Скончыў Варонежскі ун-т (1973). З 1978 у Бел. аграрным тэхн. ун-це (у 1987—2003 заг. кафедры). Навук. працы па тэорыі дэфармавання выпадкова-неаднародных асяроддзяў і вызначэнні эфектыўных модуляў у пластычных асяроддзях. Прапанаваў агульную мадэль узаемадзеяння с.-г. дэфарматараў з глебай, крытэрый ацэнкі ўстойлівасці аграэкалагічных сістэм.

Тв.: О контактном взаимодействии с предварительно напряженной упруговязкопластической средой // Весці АН Беларусі. Сер. фіз.-тэхн. навук. 1993. № 3; Термодинамический подход к исследованию критических уровней агроэкологических систем // Там жа. 1995. № 3; Теоретическая механика и методы математики. Мн., 2000 (разам з А.А.Фядутам, А.У.Чыгаравым). *Л.В.Бароўка.*

ЧЫГІР Васіль Фёдаравіч (н. 8.9.1924, в. Лешня Капыльскага р-на Мінскай вобл.), бел. юрыст. Д-р юрыд. н. (1971), праф. (1973). Засл. юрыст Беларусі (1971). Скончыў Мінскі юрыд. ін-т (1949) і працаваў у ім з 1952. З 1954 у БДУ (у 1971—91 заг. кафедры, адначасова ў 1973—83 дэкан ф-та). Навук. працы па праблемах грамадз., жыллёвага і сямейнага права, права інтэлектуальнай і прамысл. уласнасці. Адзін з аўтараў і адказны навук. рэдактар кніг «Грамадзянскае права БССР» (т. 1—3, 1975—78), «Юрыдычны энцыклапедычны слоўнік» (1992), «Каментарый да Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь» (т. 1—3, 2003), падручнікаў і навуч. дапаможнікаў для ВНУ. Удзельнічаў у распрацоўцы Канстытуцыі і Грамадз. кодэксу Рэспублікі Беларусь, шэрагу інш. заканад. актаў.

Тв.: Советское жилищное право. Ч. 1—3. Мн., 1960—64; Жилищное право. 2 изд. Мн., 1986; Советское семейное право. Мн., 1989 (у сааўт.); Новый Гражданский кодекс Республики Беларусь: Общий обзор. Мн., 1999; Физические и юридические лица как субъекты гражданского права. Мн., 2000; Гражданское право. Ч. 1—2. Мн., 2000—02 (у сааўт.); Договор найма жилого помещения: По новому жилищному законодательству. Мн., 2001.

ЧЫГІР Міхаіл Мікалаевіч (н. 24.5.1948, в. Усава Капыльскага р-на Мінскай вобл), дзяржаўны дзеяч Беларусі. Скончыў Бел. ін-т нар. гаспадаркі (1970), спецфакультэт пры Маскоўскім фін. ін-це (1982). У 1973—80 кіраўнік Клецкага аддз. Дзяржбанка СССР, потым Маскоўскага аддзялення Дзяржбанка СССР г. Мінска. У 1982—86 на парт. рабоце. З 1986 кіраўнік Мінскай гар. канторы Дзяржбанка СССР. З 1988 1-ы нам. старшыні праўлення Бел. рэсп. «Агрпрамбанка», з 1991 старшыня праўлення акцыянернага камерцыйнага «Белагрпрамбанка». З ліп. 1994 да ліст. 1996 прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь. У 1998—99 кіраўнік прадстаўніцтва Еўрап. канцэрна «СЕА» у Расіі.

М.М.Чыгір.

ЧЫГІРЫ́НКА, вёска ў Стайкаўскім с/с Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл., на паўд. беразе *Чыгірынскага вадасховішча*. Цэнтр калгаса. За 45 км ад Кіраўска, 70 км ад Магілёва, 30 км ад чыг. ст. Тошчыца. 466 ж., 177 двароў (2003). Чыгірынская ГЭС. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла партызан і сав. воіна. Каля вёскі курганны могільнік, стаянка эпохі мезаліту.

ЧЫГІРЫ́НСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА. Размешчана на мяжы Кіраўскага і Быхаўскага р-наў Магілёўскай вобл., каля в. Чыгірынка, за 30 км на У ад г. Кіраўск. Створана ў 1960 плацінай на р. Друць (78 км ад вусця). Пл. 21,1 км^2, даўж. 17 км, найб. шыр. 2,4 км, найб. глыб. 8,1 м. Аб'ём вады 55,9 млн. м^3. Катлавіна выцягнутая з Пн на Пд. Берагавая лінія даўж. 70 км нязначна парэзана дробнымі залівамі. Берагі ў прыплаціннай ч. абразійныя (37%), правы — высокі і месцамі стромкі, левы — нізкі і спадзісты. Дно — забалочаная пойма р. Друць — пераважна выслана торфам і заіленым пяском. З астравы (найб. пл. 0,37 км^2). Сярэдні шматгадовы сцёк 817 млн. м^3. Рэгуляванне сцёку сутачнае. Ч.в. моцнапраточнае, аб'ём воднай масы аднаўляецца на працягу 27 сут. Сярэднегадавая амплітуда вагання ўзроўню вады 80—85 см. Замярзае ў пач. снеж., лёд (таўшчыня да 55 см) трымаецца да пач. красавіка. Зарастае пераважна ў паўн. ч. (трыснёг звычайны, чарот азёрны, маннік ва-

Чыгірынскае вадасховішча.

дзяны, драсён земнаводны і інш.). Водзяцца лешч, шчупак, плотка, акунь. Выкарыстоўваецца для энергет. мэт (Чыгірынская ГЭС), рэкрэацыі, заняткаў воднымі відамі спорту. Зона адпачынку Чыгірынка, лодачная станцыя, паляўніча-рыбалоўная база.

А.А.Макарэвіч.

ЧЫГЛА́ДЗЕ Сярго Гедэванавіч (12.3.1923, в. Зоды Чыятурскага р-на, Грузія — 1.2.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1943. Мал. сяржант, кулямётчык Ч. вызначыўся ў баі пры вызваленні в. Дуброва Светлагорскага р-на Гомельскай вобл. 1.2.1944 з групай разведчыкаў уварваўся ў вёску, знішчыў з кулямёта больш за 70 гітлераўцаў. Паранены не пакінуў поля бою і прадаўжаў наступленне: заглушыў 2 кулямётныя кропкі ворага, знішчыў яшчэ каля 50 гітлераўцаў. Загінуў у гэтым баі.

ЧЫГРЫ́Н Іван Пятровіч (н. 10.4.1931 в. Чамяры Слонімскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. літаратуразнавец, паэт. Канд. філал. н. (1968). Скончыў БДУ (1955). Працаваў настаўнікам, у 1961—91 у Ін-це л-ры АН Беларусі. Друкуецца з 1959. Даследуе праблемы развіцця бел. прозы, узаемадзеянне фальклору і л-ры. Сааўтар кніг «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры» (1977, на рус. мове; 1981, на бел. мове), «Беларуская літаратура і праблемы сучаснасці» (1978). Складальнік зб. «Выбраныя творы» Ядвігіна Ш. (1976), анталагічнага зб. апавяданняў пісьменнікаў «Маладняка» «Веснаход» (1987). Аўтар паэт. зб-каў «Капеж» (1992), «Трыба», «Бераг» (абодва 1998), «Люблю вясну» (2000), «Вынікі падсумоўваліся ў панядзелак», «Пялёсткі полымя» (абодва 2001).

Тв.: Станаўленне беларускай прозы і фальклор: Дакастрычніцкі перыяд. Мн., 1971; Проза «Маладняка»: Дарогамі сцвярджэння. Мн., 1985; Крокі: Проза «Узвышша». Мн., 1989; Рэальнае і магчымае: Проза Я.Коласа. Мн., 1991; Паміж былым і будучым: Проза М.Гарэцкага. Мн., 1994. *А.П.Парэпка.*

ЧЫГРЫ́НАЎ Іван Гаўрылавіч (21.12.1934, в. Вялікі Бор Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл. — 5.1.1996), бел. пісьменнік. Нар. пісьменнік Беларусі (1994). Брат П.Г.*Чыгрынава*. Скончыў БДУ (1957). З 1957 працаваў у выд-ве «Навука і тэхніка», з 1962 у час. «Полымя». З 1975 нам. старшыні, з 1976 сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі. З 1987 старшыня праўлення Бел. фонду культуры, адначасова з 1989 гал. рэдактар час. «Спадчына». Друкаваўся з 1952. Пачаткам літ. дзейнасці сам Ч. лічыў 1961, калі было апублікавана апавяд. «Праз гады». У зб-ках апавяд. «Птушкі ляцяць на волю» (1965), «Самы шчаслівы чалавек» (1967), «Ішоў на вайну чалавек» (1973), «Ці бываюць у выраі ластаўкі» (1983) і інш. духоўная прыгажосць чалавека ў мірных і ваен. умовах. Раманы «Плач перапёлкі» (1970), «Апраўданне крыві» (1976, за абодва Літ. прэмія імя А.Фадзеева 1979), «Свае і чужынцы» (1983), «Вяртанне да віны» (1992) і «Не ўсе мы згінем» (1996) звязаны аднымі героямі і месцам дзеяння (вёска Верамейкі, таму наз. «верамейкаўскі цыкл»). У іх адлюстравана атмасфера ваен. часу, вясковы побыт на акупіраванай тэрыторыі, арганізацыя падполля, зараджэнне партыз. руху, даследаваны вытокі гераізму і мужнасці бел.

І.Г.Чыгрынаў.

народа, створаны яркія вобразы патрыётаў перыяду Вял. Айч. вайны. Паводле сваіх раманаў і апавяд. Ч. стварыў п'есы «Плач перапёлкі» (паст. 1980, Бел. т-р імя Я.Купалы), «Апраўданне крыві» (паст. 1984, Брэсцкі абл. драм. т-р), «Дзівак з Ганчарнай вуліцы» (паст. 1986, Тэатр-студыя кінаакцёра). Аўтар п'ес «Следчая справа Вашчылы» (1988, пра кіраўніка Крычаўскага антыфеад. паўстання 18 ст.), «Звон — не малітва» (паст. 1988, т-р імя Я.Купалы; пра княгіню Рагнеду), «Чалавек з мядзведжым тварам» (1989, погляд на эпоху Сталіна). У трагічным гратэску «Ігракі» (1990) перадваен. падзеі. Драм. фантазія «Хто вінаваты?», абразок «Толькі мёртвыя не вяртаюцца» пра Чарнобыль і звязаныя з ім праблемы. П'еса «Прымак» (1994) і драм. аповесць «Брат караля» (1995) пра бел. дзяржаўнасць часоў ВКЛ. Драма «Савіцкі» (1994) пра заступніка абяздоленых, «бел. Дуброўскага». У трагікамедыі «Госці» (паст. 1994, т-р імя Я.Купалы) аналіз стану грамадства пач. 1990-х г. П'еса «Зайграй, хлопча малы» (1995) пра бел. паэта П.Багрыма. Творчасці Ч. ўласцівы глыбокі дэталёвы аналіз унутр. свету чалавека, паэтычнасць, рэаліст. канкрэтная вобразнасць, высокая культура слова. Аўтар манаграфій «М.Я.Нікіфароўскі» (1960, з В.К.Бандарчыкам), крытыка-публіцыстычных кніг «Новае ў жыцці, новае ў літаратуры» (1983), «Паміж сонцам і месяцам: Роздум над жыццём, культурай і літаратурай» (1994). На бел. мову пераклаў п'есы «На дне» М.Горкага, «Аптымістычная трагедыя» У.Вішнеўскага і інш. Сааўтар сцэнарыя шматсерыйнага тэлефільма «Руіны страляюць...» (1970, з І.Новікавым, Дзярж. прэмія Беларусі 1974). Паводле раманаў «Плач перапёлкі», «Апраўданне крыві», «Свае і чужынцы» рэж. І.Дабралюбаў на кінастудыі «Беларусьфільм» стварыў шматсерыйны тэлефільм «Плач перапёлкі» (1991). Па матывах рамана «Плач перапёлкі» У.Кандрусевіч напісаў аднайм. сімфонію.

Тв.: Зб. тв.: У 6 т. Т. 1. Мн., 1995; Выбр. творы. Т. 1—3. Мн., 1984; Звон — не малітва: Драмы. Мн., 1993.

Літ.: Грамадчанка Т.К. Жывая памяць народа. Нарыс творчасці Івана Чыгрынава. Мн., 1984; Марціновіч А.А. Іван Чыгрынаў: Нарыс жыцця і творчасці. Мн., 1999. *Л.С.Савік.*

ЧЫГРЫ́НАЎ Пётр Гаўрылавіч (н. 29.6.1938, в. Вялікі Бор Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл.), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (1986), праф. (1988). Брат І.Г.*Чыгрынава*. Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1961). Працаваў настаўнікам, на камсамольскай рабоце, з 1971 у Ін-це гісторыі партыі пры ЦК КПБ, з 1977 у Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь. Даследуе паходжанне і развіццё матэрыяльнай, духоўнай і паліт. культуры бел. народа, станаўленне дзяржаўнасці, гіст.-паліт. аспекты развіцця грамадскай думкі на Беларусі, фарміраванне дзярж. суверэнітэту і дэмакратызацыю паліт. сістэмы ў сучасных умовах, бел.-рус. адносіны, праблемы патрыят. выхавання. Адзін з аўтараў калектыўных прац «Нарысы гісторыі Ленінскага камсамола Беларусі» (1975), «Нарысы гісторыі міліцыі Беларускай ССР, 1917—1987» (1987), «Школа мужнасці і патрыятызму: Кароткі нарыс гісторыі ДТСААФ БССР» (2-е выд. 1988).

Тв.: Да абароны Радзімы. Мн., 1973; Военно-патриотическое воспитание трудящихся. Мн., 1991; Грамадская думка ў Беларусі: Палітыка-гіст. аспект. Мн., 1996; Белорусско-российские отношения: История и современность. Мн., 1999; Очерки истории Беларуси. Мн., 2000; История Беларуси. 2 изд. Мн., 2002; Беларускі народ: вытокі, кансалідацыя, сучаснасць. Мн., 2002.

ЧЫГУ́Н, сплаў жалеза (аснова) з вугляродам (звычайна 2—4%) і інш. элементамі; адзін з найб. пашыраных (побач са *сталлю*) жалезавугляродзістых сплаваў. Мае пастаянныя дамешкі (да 4,5% крэмнію, да 1,8% фосфару, да 1,5% марганцу, не болей за 0,08% серы), часам і легіруючыя элементы (хром, нікель, ванадый і інш.). Звычайна крохкі. Характарызуецца эўтэктычным пераўтварэннем (гл. *Эўтэктыка*). Ч. — першасны прадукт перапрацоўкі *жалезных руд* плаўкай у *доменных печах*.

Вуглярод у Ч. можа знаходзіцца ў звязаным стане ў выглядзе карбіду жалеза — *цэментыту* (белы Ч.) або ў свабодным стане ў выглядзе *графіту* (шэры Ч.). Больш за 85% Ч. перапрацоўваецца ў сталь (перадзельны Ч.), астатні выкарыстоўваюць для фасоннага ліцця (ліцейны Ч.) і атрымання спец. Ч. з павялічанай колькасцю крэмнію, алюмінію, марганцу (доменныя *ферасплавы*). Паводле мікраструктуры графіту адрозніваюць шэры Ч. (вуглярод у выглядзе пласціністага графіту), высокатрывалы Ч. (шарападобны графіт) і коўкі Ч. (камякаваты графіт). Коўкі Ч. атрымліваюць адпалам адлівак, якія ў літым стане маюць структуру белага Ч.; у высокатрывалым графіт утвараецца ў літым стане ад увядзення ў вадкі Ч. мадыфікатараў (гл. *Мадыфікаванне*). Коўкі і высокатрывалы Ч. выкарыстоўваюць як канструкцыйны матэрыял

з высокай пластычнасцю і трываласцю. Для павышэння якасці чыгунных адлівак выкарыстоўваюць таксама легіраванне (гл. *Легіраваны чыгун*). Перспектыўная вытв-сць спец. Ч.: высакахромістых для выкарыстання ва ўмовах абразіўнага зносу з недастатковым цеплаадводам; нерэзіставых для ўвядзення вырабаў з яго ў дэталі з алюмінію (напр., у паршні фарсіраваных дызеляў) і інш. Ч. вядомы з 6 ст. да н.э. ў Кітаі, з сярэдзіны 14 ст. ў Зах. Еўропе, з 17 ст. ў Расіі.

Літ.: Мозберг Р.К. Материаловедение. 2 изд. М., 1991. *А.П.Ласкаўнёў.*

ЧЫГУ́НАЧНАЕ МАШЫНАБУДАВА́ННЕ, галіна транспартнага машынабудавання, прадпрыемствы якога займаюцца вытворчасцю рухомага саставу для чыгункі (лакаматывы, электравозы, вагоны, абсталяванне для іх рамонту).

Лакаматывабудаванне пачалося ў Вялікабрытаніі, дзе ў 1823 пачаў працаваць першы ў свеце паравозабуд. з-д. У Расіі першыя серыйныя паравозы выпусцілі ў 1840-я г. на Аляксандраўскім заводзе ў Пецярбургу. У 1860—1900-я г. рухомыя саставы для чыгунак выраблялі Каломенскі, Неўскі, Людзінаўскі, Воткінскі, Брагінскі, Пуцілаўскі, Сормаўскі, Харкаўскі, Луганскі паравозабуд., вагоны — Верхняволжскі, Мыцішчынскі і інш. з-ды. У СССР першы манеўровы цеплавоз пабудаваны ў 1924, электравоз — у 1932. З 1956 вытв-сць паравозаў у СССР пачала паўсюдна спыняцца, з-ды перайшлі на выпуск цеплавозаў і электравозаў. Ч.м. на тэр. СНД найб. развіта ў Расіі і Украіне. У Расіі пасажырскія, манеўровыя і прамысл. цеплавозы вырабляюць у Каломне, Мураме, Людзінаве, Бранску, Ніжнім Тагіле, Барнауле; электравозы — у Новачаркаску; грузавыя вагоны — у Ніжнім Тагіле, Алтайску, Абакане, Калінінградзе; пасаж. вагоны — у Цверы і С.-Пецярбургу; вагоны для метро — у Мыцішчах і С.-Пецярбургу; двух'ярусныя вагоны для перавозкі легкавых аўтамабіляў — у Цверы; ізатэрмічныя вагоны — у Бранску. На Украіне магістральныя грузавыя цеплавозы выпускае Луганскі з-д; электравозы для вывазкі руды з кар'ераў — Днепрапятроўскі з-д, грузавыя магістральныя вагоны — з-ды ў Крукаве, Днепрадзяржынску, Марыупалі (цыстэрны і паўвагоны). З-д па вытв-сці электравозаў працуе ў Тбілісі. З 1990 у сусв. Ч.м. вядуцца работы па праектаванні і стварэнні новых тыпаў лакаматываў і вагонаў. У Расіі з-д «Трансмаш» (г. Ціхвін) у 1993 выпусціў высокаскарасны (да 250 км/гадз) электрацягнік «Сокал». На Людзінаўскім цеплавозабуд. з-дзе сумесна з Цвярскім вагонабуд. з-дам у 2000 створаны доследны ўзор дызель-цягніка на 1100 пасажыраў, сумесна з карпарацыяй «Джэнерал мотарс» (ЗША) у 2001 — аднасекцыйны 8-восевы цеплавоз серыі ТЭРА-І з дызелем магутнасцю 4150 к.с. і макс. скорасцю 100 км/гадз. На з-дзе «Метровагонмаш» (г. Мыцішчы) у 2000 пабудаваны сучасны метроэкспрэс «Яўза», на Дземіхоўскім машынабуд. з-дзе ў 2001 — прынцыпова новы тып электрацягніка — экспрэс ЭД-6 з асінхронным цягавым рухавіком магутнасцю 8000 кВт і інш. Сярод зах. фірм, якія выпускаюць чыг. рухомы састаў, найб. вядомыя: «Джэнерал мотарс» (ЗША), «Бомбардзье» (Канада), «Альстам» (Францыя), «АДтранц» (Швейцарыя), «Сіменс» (Германія) і інш., якія маюць свае з-ды ў многіх краінах Еўропы, Амерыкі і Азіі. У лакаматыўным парку гэтых фірм пераважаюць скарасныя (140, 160, 250 км/гадз) грузавыя і пасаж. электравозы (4200—6000 кВт), дызель-цягнікі (1650—3000 кВт), цеплавозы магутнасцю да 4000 к.с. і інш. У 2000 фірма «Бомбардзье» выпусціла доследны ўзор газатурбавоза магутнасцю 5000 к.с.

На *Беларускай чыгунцы* эксплуатуюцца пераважна дызель-цягнікі Рыжскага і Дземіхоўскага з-даў, цеплавозы Ніжнетагільскага, Барнаульскага, Каломенскага, Бранскага і інш. з-даў, электравозы з Новачаркаска, пасаж. вагоны з Цверы, паязды метрапалітэна з Мыцішчанскага і Пецярб. з-даў. На Беларусі да спецыялізаваных прадпрыемстваў Ч.м. адносяцца *Гомельскі вагонарамонтны завод* (займаецца рамонтам і пераабсталяваннем вагонаў, выпускае запчасткі да іх) і *Мінскі вагонарамонтны завод* (ажыццяўляе рамонт пасаж. вагонаў, фарміраванне колавых пар для грузавых і пасаж. цягнікоў). На Магілёўскім рэгенератарным з-дзе вырабляюць запчасткі для рухомага саставу чыгунак, у Гомелі — абсталяванне для рамонту чыг. пуцей, мацаванні для рэльсаў. У Баранавіцкім дэпо рамантуюць электравозы Вл-80 і электрацягнікі ЭР-9, у Лідскім — дызель-цягнікі ДР-І і прамысл. цеплавозы ТГМ, у Ваўкавыскім і Брэсцкім — цеплавозы М62, у Жлобінскім — цеплавозы 2ТЭ10 і ЧМЭ3, у Аршанскім — цеплавозы ТЭП 70, у Віцебскім — цеплавозы 2ТЭ10, ТЭЛ60, М62. *П.І.Рогач.*

ЧЫГУ́НАЧНАЯ АЎТАМА́ТЫКА І ТЭЛЕМЕХА́НІКА, сукупнасць тэхн. сродкаў на *чыгунцы* для забеспячэння яе нармальнага функцыянавання і бяспечнага руху па ёй рухомага саставу метадамі і сродкамі аўтаматыкі і *тэлемеханікі*.

Да тэхн. сродкаў Ч.а. і т. адносяць сістэмы сігналізацыі, цэнтралізацыі і блакіроўкі, аўтавядзення цягнікоў, тэлемех. кіраванне лакаматывамі, сістэмы аўтам. і тэлемех. кіравання энергазабеспячэннем электрыфікаванай чыгункі, сродкі тэхн. дыягностыкі, аўтам. кантролю і інш.

ЧЫГУ́НАЧНАЯ КАЛЯ́Я, дзве *рэйкі*, замацаваныя паралельна на пэўнай адлегласці адна ад адной на падрэйкавай аснове (шпалах, плітах, брусах) *чыгуначнага пуці*. Рэйкі Ч.к. служаць апорнымі і накіравальнымі для колаў рухомага саставу. У краінах СНД шырыня Ч.к. 1520 мм, у Зах. Еўропе ў асн. 1435 мм. Гл. таксама *Каляіна*.

ЧЫГУ́НАЧНАЯ СІГНАЛІЗА́ЦЫЯ, сістэма сігналаў для забеспячэння бяспекі і арганізацыі руху цягнікоў на *чыгунцы*. Бываюць гукавыя і бачныя сігналы, якія падаюцца спец. прыладамі, умоўнымі знакамі і інш.

Гукавыя сігналы падаюцца духавымі ражкамі, ручнымі і лакаматыўнымі свісткамі, гудкамі і сірэнамі, станцыйнымі званамі, петардамі і інш., адрозніваюцца колькасцю і спалучэннем гукаў рознай працягласці. Для падачы бачных сігналаў на станцыях і перагонах устанаўліваюць *светлафоры, семафоры*, святлівыя дыскі, шчыткі з папераджальнымі знакамі, сігнальныя паказальнікі розных колераў і формы, сцяжкі, ліхтары, факел-свечкі і інш.



а



б

Чыгун: а — мікраструктуры графіту ў чыгунах (1 — пласціністы графіт у шэрых чыгунах; 2 — шарападобны ў высокатрывалых чыгунах, 3 — камякаваты ў коўкіх чыгунах); б — мікраструктуры шэрых (А), коўкіх (Б) і высокатрывалых (В) чыгуноў.

ЧЫГУ́НАЧНАЯ СТА́НЦЫЯ, асноўнае эксплуатацыйнае прадпрыемства *чыгуначнага транспарту*, што ажыццяўляе прыём, адпраўленне, фарміраванне і расфарміраванне цягнікоў, абслугоўванне пасажыраў, прыём і выдачу грузаў; лінейнае падраздзяленне *чыгункі*. Да асн. збудаванняў і ўстройстваў Ч.с. адносяцца: станцыйныя пуці, *чыгуначныя вакзалы* і службова-тэхн. будынкі; *платформы* (пасажырскія і грузавыя, у тл. *апарэлі*); склады, пагрузачна-разгрузачныя пляцоўкі і сродкі механізацыі работ (напр., краны розных тыпаў, *аўтакары* і *электракары*), пешаходныя масткі і тунэлі; прыстасаванні для тэхн. абслугоўвання лакаматываў і вагонаў (на буйных станцыях — лакаматыўныя і вагонныя *дэпо*); устройствы станцыйнай *чыгуначнай сігналізацыі*, блакіроўкі і сувязі (гл. таксама *Аўтаблакіроўка*). Паводле характару работы Ч.с. падзяляюцца на прамежкавыя, участковыя, сартавальныя, грузавыя і пасажырскія. Ч.с., размешчаныя на перасячэнні, злучэнні 2 ці больш чыг. ліній, утвараюць *чыгуначны вузел*. Паводле аб'ёму і складанасці работы адрозніваюць пазакласныя (з вял. аб'ёмам работы і высокім узроўнем тэхн. аснашчэння) і Ч.с. 1—5-га класаў. Назвы Ч.с. і схему іх размяшчэння на бел. чыгунцы гл. пры арт. *Беларуская чыгунка*. *І.А.Елавы.*

ЧЫГУ́НАЧНЫ ВАКЗА́Л, комплекс збудаванняў для абслугоўвання пасажыраў *чыгуначнага транспарту*, выканання грузавых, паштовых і багажных аперацый; састаўная частка *чыгуначнай станцыі*. Тэр. Ч.в. ўключае пасаж. будынак, прывакзальную плошчу, пасажырскія платформы, пешаходныя пераходы-залы (канкорсы) і масткі, багажныя тунэлі і інш.

У залежнасці ад прапускной здольнасці і адначасовай умяшчальнасці пасажыраў адрозніваюць Ч.в. малыя (да 200 чал.), сярэднія (да 900), вялікія (да 1500) і пазакласныя (больш за 1500). Пасаж. будынак уключае памяшканні: аперацыйныя (касавыя залы, камеры захоўвання багажу, вузел сувязі і інш.), для чакання і адпачынку, быт. абслугоўвання і харчавання, службовыя і дапаможныя. Паводле размяшчэння пасаж. будынка адносна пуцей Ч.в. падзяляюць на берагавыя, астраўныя, папярочныя (пры тупіковых пуцях) і камбінаваныя. Часта Ч.в. аб'ядноўваюць з вакзаламі інш. відаў транспарту (напр., аўтобусным). Гл. таксама *Вакзал*.

ЧЫГУ́НАЧНЫ ВУ́ЗЕЛ, пункт на перасячэнні некалькіх чыг. ліній, у якім размешчаны адна ці некалькі *чыгуначных станцый*; іншы раз — сукупнасць чыг. станцый, падыходаў да іх і злучальных пуцей на адной чыг. лініі. Асн. збудаванні Ч.в.: сартавальныя, грузавыя і пасаж. чыг. станцыі, злучальныя пуці паміж імі, станцыйныя збудаванні для пасажыраў, *дэпо* і інш. Бываюць Ч.в. транзітныя, транзітныя з вял. аб'ёмам перагрузачных работ і канцавыя, а таксама прамысл. (абслугоўваюць прамысл. прадпрыемствы ці раёны) і партовыя. У буйных Ч.в. перасякаецца да 20 ліній. На Беларусі больш за 30 Ч.в., з іх найбуйнейшыя Мінск, Баранавічы, Орша, Брэст, Жлобін, Асіповічы, Віцебск, Маладзечна, Магілёў, Крычаў, Гомель, Калінкавічы, Ліда, Лунінец, Полацк, Гродна, Ваўкавыск, Бабруйск. Гл. схему Беларускай чыгункі пры арт. *Беларуская чыгунка*.

Схема **чыгуначнага вузла**: а — з адной станцыяй; б — з крыжападобным размяшчэннем станцый; I—XIV — злучальныя веткі.

ЧЫГУ́НАЧНЫ МОСТ, *мост* для пераводу *чыгуначнага пуці* праз перашкоду (раку, праліў, цясніну і інш.) або праз другую дарогу. Успрымае інтэнсіўныя дынамічныя ўздзеянні, таму да яго трываласці і ўстойлівасці прад'яўляюцца павышаныя патрабаванні па стварэнні бяспекі і бесперабойнага руху цягнікоў.

На вял. рэках суднаходныя пралёты Ч.м. звычайна перакрываюць пралётнымі канструкцыямі бэлечнай сістэмы са скразнымі галоўнымі *фермамі*. Для несуднаходных пралётаў і на малых рэках выкарыстоўваюць канструкцыі са стальнымі *бэлькамі* або бэлечныя пралётныя збудаванні са зборнага і папярэдне напружанага жалезабетону. *І.І.Леановіч.*

ЧЫГУ́НАЧНЫ ПУЦЬ, комплекс інжынерных збудаванняў і ўладкаванняў у паласе адводу, якія ўтвараюць дарогу з



Чыгуначны пуць: 1 — земляное палатно; 2 — баластны слой; 3 — шпалы; 4 — рэйкі.

накіравальнай *чыгуначнай каляёй* для руху цягнікоў. Бываюць галоўныя, бакавыя, станцыйныя і інш. Выкарыстоўваецца на *чыгунках, метрапалітэне*, прамысл. прадпрыемствах і інш.

Асн. элементы Ч.п.: верхняя будова, якая ўспрымае нагрузку ад трансп. сродкаў і перадае яе на земляное палатно і грунтавую аснову (уключае чыг. *рэйкі* і іх мацаванні, стрэлачныя пераводы, шпалы, пераводныя і маставыя брусы, баластавы слой, процівугоны

Чыгуначная станцыя Мінск-Пасажырскі.

Чыгуначны вакзал станцыі Мінск-Пасажырскі.

Чыгуначны мост цераз раку Ін (Аўстрыя).

і інш.); *земляное палатно* і штучныя збудаванні (*чыгуначныя масты, тунэлі, цягавыя падстанцыі*, водапрапускныя трубы, дзюкеры, дамбы, фільтравальныя насыпы і інш.). Ч.п. мае спец. ахоўныя збудаванні, сігнальныя і *пуцявыя знакі*. Для злучэння і развіцця Ч.п. робяцца стрэлачныя вуліцы, з'езды, паваротныя трохвугольнікі, *сартавальныя горкі* і інш.

І.І.Леановіч.

ЧЫГУ́НАЧНЫ ТРА́НСПАРТ, від *транспарту* для перавозкі грузаў і пасажыраў па рэйкавых пуцях у вагонах з дапамогай мех. цягі (паравозы, цеплавозы, электравозы, матавозы і інш.). Асн. перавагі ў параўнанні з інш. відамі транспарту: універсальнасць (можа перавозіць разнастайныя сыпкія, вадкія, газападобныя і інш. грузы), вял. грузападымальнасць, правазная здольнасць, надзейнасць (мала залежыць ад умоў надвор'я). Сабекошт перавозкі грузаў на Ч.т. адзін з самых нізкіх. Першая ў свеце чыгунка агульнага карыстання з паравой цягай Стоктан—Дарлінгтан пабудавана ў Вялікабрытаніі ў 1825. У 1995 даўж. чыг. шляхоў у свеце склала 1180 тыс. км, з іх электрыфікавана 200 тыс. км. Найб. развіты Ч.т. у ЗША, Расіі, Кітаі, Індыі, Украіне, Францыі, Германіі, Польшчы, Вялікабрытаніі, Бразіліі.

Першая на Беларусі чыг. лінія Гродна—Парэчча даўж. каля 30 км пачала дзейнічаць у снеж. 1862 як частка *Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі*. Найб. значэнне для развіцця *Беларускай чыгункі* мела здадзеная ў эксплуатацыю ў ліст. 1871 чыг. магістраль Смаленск—Мінск—Брэст. У 2-й пал. 19 ст. праз тэр. Беларусі прайшлі *Рыга-Арлоўская чыгунка, Лібава-Роменская чыгунка, Палескія чыгункі* і інш. Напярэдадні 1-й сусв. вайны працягласць чыгунак на Беларусі склала 3,8 тыс. км (прыкладна 70% яе сучаснай сеткі). У 1920—30-я г. пабудаваны чыг. Унеча—Крычаў—Орша—Лепель, Крычаў—Магілёў—Асіповічы—Слуцк—Баранавічы і інш. Зараз тэр. Беларусі перасякаюць 4 шыротныя і 4 мерыдыянальныя чыг. лініі. Важнейшая шыротная магістраль — двухпутная электрыфікаваная чыг. Брэст—Орша (найб. тэхнічна абсталяваная чыгунка Беларусі). На асобных яе участках скорасць грузавых паяздоў дасягае 100 км/гадз, пасажырскіх — да 140 км/гадз. З 1960-х г. пачалася электрыфікацыя чыгунак Беларусі. У 1966 на электрацягу пераведзены ўчастак Мінск—Маладзечна, у 1973 — Мінск—Асіповічы, у 1974 — Мінск—Барысаў, у 1975 — Мінск—Стоўбцы. На 1.1.2000 даўж. электрыфікаваных чыг. пуцей на Беларусі складае 894 км (16% іх агульнай даўжыні). Беларусь мае даволі густую сетку чыгунак (27 км на 1000 км²), саступае па гэтым паказчыку ў СНД толькі Украіне, Малдове і Арменіі. На долю Ч.т. ў 2001 прыпадала 74,3% усяго грузаабароту і 53% пасажыраабароту ўсіх відаў транспарту Беларусі. Аб развіцці Ч.т. на Беларусі гл. табл. 1.

Табліца 1

Асноўныя паказчыкі развіцця чыгуначнага транспарту Беларусі

	1990	1995	2001
Чыгуначныя шляхі агульнага карыстання, км	5569	5564	5529
у т.л. электрыфікаваныя, км	890	894	894
Перавезена грузаў, млн. т	121,5	47,1	51,1
Грузаабарот, млн. ткм	75430	25510	29727
Перавезена пасажыраў, млн. чалавек	147,2	141,1	150,1
Пасажыраабарот, млн. пасажыра-км	16852	12505	15264
Сярэдняя масса (брута) грузавога цягніка, т	2758	2981	3098

Сярод грузаў, якія перавозяцца Ч.т. Беларусі, нафта і нафтапрадукты складаюць 27,3% ад усіх перавезеных грузаў, будматэрыялы — 26,3%, хім. ўгнаенні — 18,7%, лесаматэрыялы — 5,3%, цэмент — 2,9%, чорныя металы — 2,8%, інш. грузы — 13,9%. Транзіт міжнар. грузаў праз Беларусь у 2001 склаў 26,6 млн. Гл. таксама *Беларуская чыгунка*.

П.І.Рогач.

ЧЫГУ́НАЧНЫЯ ВО́ЙСКІ, спецыяльныя войскі, прызначаныя для тэхн. прыкрыцця, аднаўлення, буд-ва і эксплуатацыі чыг. напрамкаў з мэтай забеспячэння баявой дзейнасці ўзбр. сіл у ваен. час; у мірны час выкарыстоўваюцца для тэхн. прыкрыцця буйных чыг. аб'ектаў, буд-ва новых і павелічэння прапускной здольнасці існуючых ліній.

Да арт. **Чыгуначныя войскі**. Воіны-чыгуначнікі наводзяць мост цераз водную перашкоду.

Ваенізаваныя фарміраванні на рас. чыгункі ўзніклі ў 1851. Пазней іх замянілі чыг. батальёны, сфарміраваныя на ўзор армейскіх вайск. часцей. Першы такі батальён сфарміраваны ў г. Баранавічы ў 1876, пазней — яшчэ 3 батальёны, а ў 1886 у Баранавічах — першая ў свеце чыг. брыгада. Як асобны від войск Ч.в. існуюць з 1904 (складаліся з Баранавіцкай, Туркестанскай, Закаспійскай і Заамурскай брыгад). У 1-ю сусв. вайну Ч.в. пабудавана 6 тыс. км чыгункі, з іх 1 тыс. км на Беларусі. У час грамадз. вайны і ваен. інтэрвенцыі ваен. чыгуначнікі ў Расіі аднавілі 22 тыс. км чыгункі, у т.л. 4 тыс. на Беларусі, 3169 мастоў, у т.л. 300 на Беларусі. Пасля грамадз. вайны чыг. батальёны перайменаваны ў палкі, некат. з якіх дыслацыраваліся ў Віцебску, Гомелі, Жлобіне і інш.; выконвалі аднаўленчыя работы на станцыях Слуцк, Бабруйск, Орша, Барысаў. У 1926—40 Ч.в. пабудавалі на тэр. Беларусі чыг. лініі Орша—Лепель, Гомель—Чарнігаў, Рослаўль—Магілёў—Асіповічы, вялі аднаўленчыя работы на напрамку Полацк—Маладзечна—Ліда—Масты. У Вял. Айч. вайну ў ходзе *Беларускай аперацыі 1944* для аднаўленчых і эксплуатацыйных работ на Беларусі было сканцэнтравана 14 чыг. брыгад. Яны аднавілі ўчасткі Смаленск—Полацк—Шаўляй, Смаленск—Орша—Мінск, Асіповічы—Баранавічы—Беласток, масты цераз Дняпро каля г. Жлобін, цераз Зах. Дзвіну каля Віцебска і Полацка, цераз Бярэзіну каля в. Шацілкі, цераз Прыпяць каля г. Мазыр, цераз Сож каля Гомеля і інш. З 1965 на тэр. Беларусі дыслацыравалася 30-я асобая чыг. брыгада. Яе часці ўдзельнічалі ў буд-ве другіх пуцей на участках Гомель—Жлобін—Асіповічы, Калінкавічы—Оўруч, Гомель—Церахоўка, Лунінец—Ракітнае, Памыслішча—Дзехцяроўка. З падраздзяленнямі Бел. чыгункі войскі ўдзельнічалі ў рэканструкцыі чыг. станцый у Мінску, Віцебску, Брэсце, Гомелі, Лунінцы, Бабруйску; буд-ве пад'язных пуцей да шэрагу заводаў, фабрык, прадпрыемстваў і інш. Ч.в. ўдзельнічалі ў ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС (замена пад'язных пуцей да 4-га энергаблока і інш.).

У студз. 1992 паводле пастановы СМ створаны Ч.в. Рэспублікі Беларусь, у якія ўваходзяць часці, прызначаныя для збудавання земляного палатна, мастоў, рамонту чыг. тэхнікі і інш., а таксама інш. спец. падраздзяленні. Ч.в. працавалі на рэканструкцыі трамвайных пуцей у Мінску і Віцебску, навядзенні пантонных мастоў, дэмаркацыі дзярж. мяжы з Літвой і Латвіяй, пракладцы кабельных ліній, электрасетак і інш.

Літ.: Степук А. Железнодорожные войска // Армия. 1999. № 4. *А.В.Ганчароў.*

ЧЫГУ́НКА, комплекснае прадпрыемства *чыгуначнага транспарту*, якое забяспечвае перавозку пасажыраў і грузаў паяздамі па *чыгуначным пуці*; у вузкім сэнсе — рэйкавая дарога для руху паяздоў. Адрозніваюць Ч. магістральныя (агульнага карыстання), *прамысловага транспарту* (пад'язныя пуці прадпрыемстваў, лесавозныя, руднічныя, заводскія і інш.), гарадскія наземныя *(трамвай)* і падземныя *(метрапалітэн)*; шырокакалейныя (у краінах СНД 1520 мм, за мяжой пераважна 1435 мм, у асобных краінах 1676 мм) і вузкакалейныя (1000, 914, 891, 750 мм і інш.). Рухомы састаў Ч. складаецца з *лакаматываў* і *вагонаў*; на сучасных чыгунках выкарыстоўваецца пераважна цеплавозная і эл. цяга, часам (пераважна на прамысл. транспарце) маторная цяга (*цеплавозы, электравозы, газатурбавозы, дызель-паязды, матавозы*).

Правобразам Ч. былі рэйкавыя (драўляныя, каменныя) каляіны, па якіх у старажытнасці перамяшчалі цяжкія грузы. З 15 ст. на рудніках Англіі і Ірландыі, а пазней у Францыі і Расіі выкарыстоўваліся дарогі з чыгуннымі рэйкамі, з коннай і канатнай цягай. Першая Ч. з паравой цягай (ад *паравоза*) пабудавана ў 1825 Дж.Стэфенсанам у Англіі (Дарлінгтан—Стоктан, працягласць 21 км); у Расіі ў 1837 (С.-Пецярбург—Царскае Сяло, 27 км). У 1851 закончана буд-ва 2-калейнай магістралі Пецярбург—Масква. Праз тэр. Беларусі ў 2-й пал. 19 ст. пракладзены ўчасткі: у 1862 Парэчча—Гродна (30 км) і далей да сучаснай мяжы з Польшчай (як ч. *Пецярбурга-Варшаўскай чыгункі*); у 1866—69 Заволь-ша—Віцебск—Полацк—Бігосава (уваходзіў у склад *Рыга-Арлоўскай чыгункі*). Пачаткам развіцця *Беларускай чыгункі* лічыцца 1871, калі была пабудавана магістраль Смаленск—Мінск—Брэст. У 1891—1904 праведзена Ч. ад Чэлябінска да Уладзівастока. У канцы 19 ст. пачалі фарміравацца *чыгуначныя вузлы*, стварацца *горкі сартавальныя*. Электрыфікацыя Ч. пачалася ў 1926.

1

2

3

4

5

Чыгунка: 1 — таварны паравоз серыі В Маскоўска-Брэсцкай чыгункі (пабудаваны Каломенскім заводам у 1871—72); 2 — чыгуначны вакзал станцыі Мінск-Віленскі, 1891; 3 — грузавы двухсекцыйны цеплавоз ТЭ3; 4 — аўтаматрыса АС1А; 5 — пасажырскі электравоз пераменнага току ЧС-4^{т}.

Укладка чыг. пуці робіцца *пуцеўкладчыкамі*, рамонт і абслугоўванне — *пуцявымі машынамі*. Чыг. гаспадарка складаецца з лінейных падраздзяленняў — аддзяленняў, *дыстанцый, дэпо, чыгуначных станцый* і інш. Галіновыя службы Ч.: служба руху, пасажырская, грузавая, лакаматыўнай гаспадаркі, сігналізацыі і сувязі, энергагаспадаркі і інш. Асн. тэхн. сродкі Ч.: чыг. пуць (2 чыг. *каляіны* з чыг. *рэек, земляное палатно, чыгуначныя масты, тунэлі* і інш.), рухомы састаў, *цягавыя падстанцыі, кантактавыя сеткі, чыгуначная сігналізацыя* і сувязь, *чыгуначная аўтаматыка і тэлемеханіка*) (у т.л. *аўтаблакіроўка, аўтадыспетчар, аўтастоп, аўтасчэпка*), збудаванні і ўстройствы для тэхн. агляду і рамонту рухомага саставу, фарміравання паяздоў, збудаванні і абсталяванне для абслугоўвання пасажыраў, грузавых, паштовых і багажных аперацый (*чыгуначныя вакзалы*, платформы, майстэрні, склады). Скорасць руху паяздоў на звычайных магістральных лініях 60 км/гадз, на скарасных участках 120—160 км/гадз, на высокаскарасных 200 км/гадз і больш.

Літ.: Железные дороги. М., 1981; Железная дорога Беларуси: История и современность. Мн., 2001. *І.І.Леановіч.*

ЧЫЖ (Spinus, або Carduelis, spinus), птушка сям. ўюрковых атр. вераб'інападобных. Пашыраны ў Еўразіі, у т.л. на Беларусі. Жыве пераважна ў мяшаных драбналіста-яловых лясах.

Даўж. да 13 см, маса да 14 г. Апярэнне самца зеленавата-жоўтае з цёмнымі стракацінамі, на галаве чорная «шапачка» і чорная пляма пад дзюбай. Крылы і хвост чорныя з жоўтымі палоскамі. Брушка белае. Самка шэра-зялёная са стракацінамі. Дзюба канічная, кароткая. Нясе 3—6 яец. Корміцца насеннем елкі, бярозы, вольхі, дзікіх траў, дробнымі насякомымі. *Э.Р.Самусенка.*

Чыж: 1 — самец; 2 — самка.

ЧЫЖ Аркадзь Сямёнавіч (н. 25.10.1930, в. Бабінкі Дрыбінскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне тэрапіі ўнутр. хвароб. Д-р мед. н. (1974), праф. (1978). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1955). З 1958 у Ін-це біяфізікі АМН СССР (г. Азёрск Чэлябінскай вобл.). У 1964—68 гал. тэрапеўт Міністэрства аховы здароўя Беларусі, адначасова ў Мінскім мед. ін-це. З 1967 у Бел. мед. акадэміі паслядыпломнай адукацыі (з 1969 заг. кафедры). У 1976—77 асабісты ўрач Ю.*Цэдэнбала*. У 1984—94 гал. нефролаг Міністэрства аховы здароўя Беларусі. З 1990 прэзідэнт Бел. і член Еўрап. асацыяцыі нефролагаў. Навук. працы па паталогіі ўнутр. органаў, пераважна нырак.

Тв.: Протеинурия: Клинич. значение и патогенез. Мн., 1983; Нефрология в терапевтической практике. Мн., 1988 (у сааўт.); Практическое руководство по нефрологии. Мн., 2001 (у сааўт.).

ЧЫЖ Іван Міхайлавіч (н. 7.1.1949, в. Шылін Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл.), расійскі вучоны ў галіне ваен. медыцыны. Д-р мед. н. (1996), праф. (1998). Скончыў 4 курсы Віцебскага мед. ін-та (1970), Самарскі мед. ін-т (1972), Ваенна-мед. акадэмію (1981). З 1972 у Прыкарпацкай ваен. акрузе, з 1983 нач. мед. службы групы сав. войск у Германіі, з 1987 у Туркестанскай ваен. акрузе. З 1991 у Гал. ваен.-мед. управленні Міністэрства абароны Расіі (з 1993 нач.). Навук. працы па рэфармаванні мед. службы Узбр. Сіл Расіі, распрацоўцы прынцыпаў арганізацыі мед. забеспячэння войск ва ўмовах ваен. канфліктаў і інш. Дзярж. прэмія Расіі 1997.

Тв.: Современные тенденции развития военной медицины. М., 1995; Организационные основы построения современной системы медицинского обеспечения Вооруженных Сил // Воен.-мед. журн. 1996. № 1.

ЧЫЖО́ЎСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА. Размешчана ў паўд.-ўсх. ч. Мінска. Створана ў 1960 плацінай на р. Свіслач (232 км ад вусця). Уваходзіць у склад *Слепянскай воднай сістэмы*. Пл. 1,63 км^2, даўж. 3,5 км, найб. шыр. 900 м, найб. глыб. 4,7 м. Аб'ём вады 2,87 млн. м^3. Катлавіна — затопленая пойма р. Свіслач. 9 астравоў (агульная пл. 6 га). Сярэдні шматгадовы сцёк 379 млн. м^3. Рэгуляванне сцёку сезоннае. Ч.в. моцнапраточнае. Водзяцца карп, плотка, шчупак, джгір. Выкарыстоўваецца для тэхн. водазабеспячэння трактарнага і аўтамаб. з-даў і ЦЭЦ-3, добраўпарадкавання Мінска, як зона адпачынку. Па другі бок плаціны, на старой пойме р. Свіслач, Мінскі заапарк. *А.А.Макарэвіч.*

«ЧЫ́ЖЫК», бел. нар. танец, від *кадрылі*. Муз. памер 2/4. Тэмп умераны. Выконвалі 4 пары. Зафіксаваны ў 19 ст. У наш час на Магілёўшчыне і ва ўсх. Паазер'і існуе як дзіцячы карагод і калена кадрылі. Вядомы таксама ў рускіх.

ЧЫ́ЖЫК Сямён Пятровіч (1923, г. Барысаў Мінскай вобл. — 2001), расійскі фізік. Д-р тэхн. н. (1972), праф. (1972). Скончыў Маскоўскі мех. ін-т (1951). З 1951 на прадпрыемстве Міністэрства сярэдняга машынабудавання СССР, з 1961 у Падольскім тэхнал. НДІ. У 1964—73 і 1978—92 ва Усесаюзным н.-д. праектна-канструктарскім і тэхнал. ін-це крыніц току (нач. аддзялення), у 1973—78 у Маскоўскім авіяц. тэхнал. ін-це (заг. кафедры). Навук. працы па фізіцы і тэхналогіі высокадысперсных асяроддзяў. Разам з інш. распрацаваў канцэпцыю адрозных ад кулонаўскіх сіл электрастатычнага ўзаемадзеяння паміж малымі метал. часцінкамі (сілы ўзаемнага зараджвання). Дзярж. прэмія СССР 1954. Ленінская прэмія 1958.

С.П.Чыжык.

Тв.: Ультрадисперсные металлические среды. М., 1977 (разам з І.Дз.Морахавым, Л.І.Трусавым); Малые металлические частицы в физике и химии (разам Л.К.Грыгор'евай, Э.Л.Нагаевым) // Природа. 1988. № 6. *М.М.Касцюковіч.*

ЧЫ́ЖЫК Яўген Іванавіч (н. 28.10.1938, в. Дарашэвічы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл.), бел. вучоны ў галіне машынабудавання. Канд. тэхн. н. (1972), праф. (1993). Засл. работнік адукацыі Беларусі (1999). Скончыў Магілёўскі маш.-буд. ін-т (1965), дзе і працаваў (у 1973—75 дэкан ф-та, з 1975 прарэктар). У 1992—2003 рэктар Магілёўскага ун-та харчавання. Навук. працы па даследаванні працэсаў распрацоўкі грунтоў выбухова-мех. спосабам. Распрацаваў метадыку мадэліравання вышэйназваных працэсаў і рэкамендацыі па вызначэнні параметраў рабочых органаў выбухова-мех. дзеяння.

Тв.: Землеройно-транспортные машины. Могилев, 1992.

Чыжоўскае вадасховішча.

ЧЫЖЭ́ВІЧЫ, вёска ў Салігорскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 300 м на Пн ад украіны г. Салігорск, 130 км ад Мінска. 390 ж., 183 двары (2003). Бібліятэка. Помнік загінуўшым працаўнікам ВА «Беларуськалій». Помнік архітэктуры — Свята-Пакроўская царква (1795—1808). У 1949 каля Ч. упершыню на Беларусі былі выяўлены калійныя солі.

ЧЫЖЭ́ЎСКІ Аляксандр Леанідавіч (26.1.1897, г. Цехановец, Падляскае ваяводства, Польшча — 20.12.1964), расійскі біяфізік, адзін з заснавальнікаў *геліябіялогіі*. Скончыў Маскоўскі археал. ін-т (1917) і Маскоўскі камерцыйны ін-т (1918), вучыўся на фіз.-матэм. (1915—19) і мед. ф-тах Маскоўскага ун-та, дзе і працаваў у 1917—27. З 1925 у Лабараторыі зоапсіхалогіі Наркамата асветы Расіі, з 1931 заг. Цэнтр. н.-д. лабараторыі іанізацыі. З 1937 заг. лабараторыі Упраўлення буд-вам Палаца Саветаў. Навук. працы па даследаванні ўплыву касм. фізічных фактараў і ўздзеяння паветр. іонаў (аэронаў) на жывыя арганізмы, што выкарыстоўваецца ў т.зв. «люстры Ч.» Устанавіў залежнасць паміж цыклămі сонечнай актыўнасці і многімі з'явамі ў біясферы. Аўтар успамінаў «Усё жыццё» (1974) і зб. «Вершы» (1987).

Тв.: Аэроионификация в народном хозяйстве. М., 1960; Земное эхо солнечных бурь. 2 изд. М., 1976; Космический пульс жизни: Земля в объятиях солнца. Гелиотараксия. М., 1995.

Літ.: Ягодинский В.Н. А.Л.Чижевский, 1897—1964. М., 1987. *У.С.Ларыёнаў.*

ЧЫЖЭ́ЎСКІ Міхаіл Рыгоравіч (12.1.1896, г. Добруш Гомельскай вобл. — 28.9.1964), бел. вучоны ў галіне земляробства. Чл.-кар. АН Беларусі (1940), д-р с.-г. н. (1950), праф. (1934). Скончыў Маскоўскую с.-г. акадэмію (1923) і працаваў там (з 1938 заг. кафедры). Даследаваў глебы Беларусі. Працы па асваенні севазвароту, сістэме апрацоўкі глебы, спосабах паглыблення і акультурвання ворнага пласта, павышэння ўрадлівасці дзярнова-падзолістых глеб.

М.Р.Чыжэўскі.

Тв.: Введение и освоение правильных севооборотов в колхозах. М., 1948; Земледелие с основами почвоведения. 2 изд. М., 1959 (у сааўт.).

ЧЫКАВА́НІ Сімон Іванавіч (9.1.1903, с. Наэсакава Мартвілскага р-на, Грузія — 24.4.1966), грузінскі паэт. Вучыўся ў Тбіліскім ун-це (1923—25). Друкаваўся з 1924. Першы зб. «Думы на беразе Куры» (1925). У зб. «Перамога» (1942), ліра-эпічнай паэме «Песня пра Давіда Гурамішвілі» (1942—46), цыклах вершаў «На польскай дарозе», «Кветкі за Одэрам» (абодва 1953) тэма сувязі часоў, інтэрнац. дружбы і салідарнасці. Аўтар зб-каў «Калхідскія вечары» (1933), «Новыя дзённікі» (1953), «Шэсцьдзесят вершаў» (1963), аўтабіягр. хронікі «Я з дому выйшаў на дарогі радзімы» (1941), ліра-эпічнага цыкла «Гянджынскі сшытак» (1964—65). Дзярж. прэмія СССР 1947. На бел. мову асобныя яго творы пераклалі В.Жуковіч, М.Маляўка.

Тв.: Рус. пер. — Избр. лирика. М., 1969; Звенящий родник. М., 1970; Лирика. М., 1973.

ЧЫКА́ГА (Chicago), горад на Пн ЗША (штат Ілінойс). 2,8 млн. ж. (1998; Вял. Чыкага з прыгараднай зонай у штатах Індыяна і Вісконсін — 8,1 млн. ж.). Найб. трансп. вузел ЗША, у т.л. чыг. вузел (другі пасля Нью-Йорка), порт на воз. Мічыган пры ўпадзенні ў яго каналізаванай р. Чыкага, па якой праходзіць водны шлях з *Вялікіх азёр* у р. Місісіпі. Міжнар. аэрапорт О'Хара. Найбуйн. эканам., гандл.-фінансавы, навук. і культ. цэнтр краіны. Найбуйн. цэнтр цяжкай прам-сці. Прам-сць: чорная і каляровая металургія (25% нац. выплаўкі сталі), машынабудаванне, металаапрацоўка (вытв-сць прамысл. абсталявання, металаканструкцый, труб, метал. тары, чыг. вагонаў і лакаматываў, кавальска-прэсавага абсталявання, металарэзных станкоў, інструментаў і інш.), эл.-тэхн., радыёэлектронная (тэлеграфна-тэлефонная апаратура, быт. электра-, радыё- і тэлевізійная тэхніка), аўтамаб., прыборабуд., авіяцыйная, хім., нафтаперапр., папяровая, паліграф., харчовая. Метрапалітэн. 7 ун-таў. Музеі: натуральнай гісторыі, навукі, і прам-сці і інш. Т-ры: «Шуберт-тыятр», «Блэкстан-тыятр».

Першапачаткова тэр. сучаснага Ч. была заселена індзейцамі. Першыя еўрапейцы (франц. езуіты) з'явіліся тут у 1673. У 1776 засн. гандл. факторыя (пункт збору футра). У 1803—12, 1816—37 тут быў ваен. пост Форт-Дырборн (у 1812 разбураны індзейцамі). Пабудаваны на гэтым месцы пас. Ч. ў 1837 атрымаў статус горада. Пасля будаўніцтва канала Ілінойс—Мічыган (1848) і чыгункі да Атлантычнага ак. (1852) па колькасці насельніцтва Ч. выйшаў на 2-е месца пасля Нью-Йорка. Танная рабочая сіла з-за вял. наплыву эмігрантаў з Азіі і Еўропы, у т.л. з Беларусі, спрыяла хуткаму развіццю прам-сці. У 1871 значная ч. горада згарэла. У 19 ст. Ч. — цэнтр рабочага руху (стачкі 1886, 1877, 1894). У 1893 тут праходзіў Сусв. калумбійскі кірмаш. З пач. 20 ст. Ч. — буйны амер. фін. цэнтр. У Ч. жыве шмат беларусаў (гл. раздзел Беларусы ў ЗША у арт. *Злучаныя Штаты Амерыкі*).

Пасля пажару 1871 горад адбудаваны, з'явіліся небаскробы з метал. каркасам (архітэктары т. зв. чыкагскай школы): Лейтэрбілдынг (1889—91, цяпер «Сірс і Робак»), універмаг

Да арт. **Чыкага**. Будынкі «Кукурузныя пачаткі».

Да арт. **Чыкага**. Від цэнтра горада.

Да арт. **Чыкага**. Л.Г.Салівен. Універмаг фірмы «Карсан-Піры-Скот». 1899—1904.

фірмы «Карсан-Піры-Скот» (1889—1904, арх. Л. Салівен). Парадны «азёрны фасад» забудаваны гіганцкімі небаскробамі дзелавога цэнтра Луп, тут гал. магістралі, раён багатых асабнякоў «Залаты бераг» і паркаў. У 20 ст. ў цэнтры Ч. ўзведзены вышынныя будынкі, парадныя комплексы, у т.л. грамадскі цэнтр (1963—65, арх. Дж. Браўнсан), пракладзены скарасныя аўтамагістралі. Вылучаюцца пабудовы арх. Ф.Л.*Райта* (дом Робі, 1908—09; цяпер у комплексе Чыкагскага ун-та), *Л.Міс ван дэр Роэ* (комплекс Ілінойскага тэхнал. ін-та, 1942—58), Б.Голдберга (вышынныя жылыя дамы «Марына-Сіці», 1964), арх. фірмы «СОМ» (109-павярховы небаскроб Сірс-білдынг, 1970—74, выш. 442 м).

ЧЫКА́ГСКАЯ ШКО́ЛА ў палітэканоміі, кірунак у эканам. думцы 20 ст., прадстаўнікі якога стаяць на пазіцыях неалібералізму. Узнікла ў сярэдзіне 1960-х г. у Чыкагскім ун-це. Заснавальнік М.*Фрыдмен*, гал. прадстаўнікі — Г.К.*Сайманс*, Ф.Найт, Дж.Стыглер. Выступае за неўмяшанне дзяржавы ў эканоміку, зыходзячы з таго, што рынкавы механізм сам забяспечвае яе функцыянаванне. Гал. інструментам уздзеяння на эканоміку лічаць рэгуляванне грашовай масы — *манетарызм*. Спады вытв-сці прадстаўнікі Ч.м. звязваюць з парушэннямі ў крэдытна-грашовай сферы, цыклічныя хістанні вытв-сці і беспрацоўе разглядаюць як натуральнае праяўленне самарэгулявання рынку.

ЧЫКА́ЛАВА Ірына Рамуальдаўна (н. 14.8.1961, Мінск), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (2001), праф. (2002). Скончыла Мінскі пед. ін-т (1983). З 1989 у Бел. пед. ун-це. Даследуе гісторыю прафес.-тэхн. адукацыі Беларусі, паліт. і сац.-эканам. гісторыю замежных краін, гендэрныя праблемы гісторыі сусв. жаночага руху.

Тв.: Западная Европа и Соединенные Штаты Америки (1815—1918 гг.). Мн., 2000 (разам з Р.А.Чыкалавым); Партии и власть в США и Великобритании: Гендерная политика в 1970—1990 гг. Мн., 2000. *У.М.Міхнюк.*

ЧЫ́КВІН Ян Арцёмавіч (н. 18.5.1940, в. Дубічы Царкоўныя Падляскага ваяв., Польшча), бел. паэт, літаратуразнавец. Д-р габілітаваны гуманіт. н. (1984), праф. (1993), праф. тытулярны (1998). Скончыў Варшаўскі ун-т (1964). З 1964 настаўнічаў у Беластоку. З 1969 навук. супрацоўнік філіяла Варшаўскага ун-та ў Беластоку, з 1985 — Варшаўскага ун-та, з 1997 — Ун-та ў Беластоку. З 1989 старшыня Бел. літ. аб'яднання «Белавежа», з 1990 рэдактар выдавецкай серыі «Бібліятэка Беларускага літаратурнага аб'яднання «Белавежа», з 1998 — літ.-маст. і беларусазнаўчага час. «Тэрмапілы». Друкуецца з 1957. Даследуе бел. і рус. паэзію 19 і 20 ст., л-ру бел. эміграцыі, тэорыю л-ры: манаграфіі «Афансій Фет: гістарычна-літаратурнае даследаванне» (1984, на польскай мове), «Далёкія і блізкія: Беларускія пісьменнікі замежжа» (1997). Аўтар бібліягр. даведнікаў «Беларуская літаратура Польшчы, 1957—1998» (1998), «Польская беларуская беларутэніка, 1945—1998» (1998, з Г.Харытанюк). У кн. паэзіі «Ідуў» (1969), «Святая студня» (1970), «Неспакой» (1977), «Светлы міг» (1989), «Кругавая чара» (1992), «Свет першы і апошні» (1997), «Крэйдавае кола» (2002) філас. праблемы быцця, харство роднай прыроды, тэма кахання, тонкія зрухі чалавечай душы. Піша апавяданні, п'есы. Выступае як перакладчык з польскай і бел. моў.

Літ.: Сляза пякучая Айчыны: Творчы партрэт Яна Чыквіна. Беласток, 2000; Раманчук А. Гарыць мая свяча: Творчая індывідуальнасць Яна Чыквіна. Беласток, 2000; Zaniewska T.Podróż daremna: Krajobraż w poezji Jana Czykwina // Zaniewska T.Podróż daremna: Szkice o poezji białoruskojęzycznej w Polsce. Białystok, 1992; McMillin A. Jan Čykvin: A sensitive intellect // McMillin A. Belarusian literature of the diaspora. Birmingham, 2002.

ЧЫКІЛІ́, вёска ў Глускім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр Казловіцкага с/с. За 25 км на ПнУ ад г.п. Глуск, 150 км ад Магілёва, 12 км ад чыг. ст. Брожа. 133 ж., 59 двароў (2003). Клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла партызан.

ЧЫКЛА́Ё (Chiclayo), горад на ПнЗ Перу, на *Панамерыканскай шашы*, адм. ц. дэпартамента Ламбаеке. Засн.ў 1835. 951 тыс. ж. (2001). Чыг. станцыя. Цэнтр с.-г. раёна (рыс, цукр. трыснёг). Прам-сць: харчасмакавая (цукр., рысачышчальная) і інш., вытв-сць будматэрыялаў. Ун-т.

ЧЫЛАЭ́ (Chiloé), востраў у Ціхім ак., найб. ў *Чылійскім архіпелагу*; тэр. Чылі. Пл. 8 тыс. км^2. Аддзелены ад мацерыка Паўд. Амерыкі прал. Чакао і залівамі Анкуд і Каркавада. На З горныя масівы (выш. да 820 м), на У узгорыстая раўніна. Усх. берагі моцна парэзаныя. Клімат умераны акіянічны. Сярэднямесячныя т-ры 7—14 °С. Ападкаў 2—3 тыс. мм за год. Вечназялёныя мяшаныя лясы. Лесараспрацоўкі, рыбалоўства, збор вустрыц. Гал. горад і порт — Анкуд.

ЧЫ́ЛІ (Chile), Рэспубліка Чылі (República de Chile), дзяржава на ПдЗ Паўд. Амерыкі. Мяжуе на Пн з Перу, на У з Аргенцінай і Балівіяй, на З абмываецца Ціхім акіянам. У складзе Ч. прыбярэжныя а-вы *Чылійскага архіпелага*, зах. ч. в-ва *Вогненная Зямля*, а-вы ў Ціхім ак.: Сан-Амбросіо, Сан-Фелікс, Хуан-Фернандэс, Сала-і-Гомес, Рапануі (Вялікадня). Пл. 756,6 тыс. км^2. Нас. 15 499 тыс. чал. (2002). Афіц. мова — іспанская. Сталіца — г. *Сант'яга*. Краіна падзяляецца на 12 рэгіёнаў і сталічную акругу. Нац. свята — Дзень абвяшчэння незалежнасці (18 вер.).

Герб і сцяг **Чылі**.

Дзяржаўны лад. Ч. — прэзідэнцкая рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1980 (з папраўкамі 1990). Кіраўнік дзяржавы і ўрада — прэзідэнт, які выбіраецца ўсеагульным галасаваннем на 6 гадоў. Вышэйшы заканад. орган — Нац. кангрэс, які складаецца з сената (46 сенатараў, з іх 9 назначаны пажыццёва, астатнія — выбраныя) і палаты дэпутатаў (120 дэпутатаў). Склад сената кожныя 4 гады абнаўляецца напалову; палата дэпутатаў выбіраецца ўсеагульным галасаваннем на 4 гады. Вышэйшы выканаўчы орган — Кабінет міністраў.

Прырода. Ч. займае вузкую (шыр. ад 15 да 335 км), пераважна горную, паласу сушы працягласцю 4300 км паміж узбярэжжам Ціхага ак. і высакагор'ямі Андаў. На З з Пн на Пд (да 41°30′ паўд. ш.) цягнуцца Берагавыя Кардыльеры (выш. да 3200 м), на У — Гал. Кардыльера Андаў з найб. выш. Ч., га-

рой Охас-дэль-Салада (6880 м). Паміж імі тэктанічная ўпадзіна — Падоўжная даліна. На ПнУ — паўд.-зах. ч. вулканічнага нагор'я Цэнтр. Андаў, на крайнім ПдУ — участкі раўнін Патагоніі і зах. ч. в-ва Вогненная Зямля. Вяршыні Андаў да 35° паўд. ш. перавышаюць 6000 м і з'яўляюцца конусамі патухлых і дзеючых вулканаў. Паўд. Ч. мае фіёрдавы характар; уся тэр. сейсмічная. Карысныя выкапні: медныя, малібдэнавыя, свінцовыя, цынкавыя, жал. і марганцавыя руды, нафта, прыродны газ, каменны вугаль, прыродная сера, салетра, каменная соль, золата, серабро. Клімат Паўн. Ч. (да 28° паўд. ш.) трапічны пустынны. Сярэдняя т-ра ліп. 15,6 °С, студз. 20,8 °С. Ападкаў да 100 мм за год, у пустынях Атакама, Тамаругаль не выпадаюць па некалькі гадоў. У Цэнтр. Ч. (да 42° паўд. ш.) клімат субтрапічны міжземнаморскага тыпу з зімовымі дажджамі. Сярэдняя т-ра ліп. 7,7 °С, студз. 19,7 °С, ападкаў ад 200 да 2500 мм за год. У Паўд. Ч. халаднаваты вільготны клімат умераных шырот. Сярэдняя т-ра ліп. ад 7 да 1 °С, студз. ад 14 да 7 °С, ападкаў на ўзбярэжжы 2500—3000 мм за год, на зах. схілах Андаў да 7000 мм. На ПдУ кантынентальнасць павялічваецца, сярэднямесячныя т-ры ад 2 да 11 °С, ападкаў да 230 мм за год. Рачная сетка больш развітая ў цэнтр. і паўд. частках Ч., рэкі горныя, кароткія, паўнаводныя. Шмат канцавых ледавіковых азёр. У Гал. Кардыльеры развіта магутнае зледзяненне. Расл. покрыва ў Паўн. Ч. амаль адсутнічае (пясчаныя дзюны, барханы), трапляюцца кактусы, салянкі, на берагавой паласе ў перыяд туманаў — пустынная фармацыя ламас. У сярэдняй ч. ў далінах рэк вечназялёныя хмызнякі і дрэвы (цік, літрэ, мыльнае дрэва кільяй) на маламагутных шэракарычневых глебах. На схілах гор да выш. 1200 м лясы міжземнаморскага тыпу, вышэй — хвойныя, якія змяняюцца альпійскімі лугамі. На Пд сярэдняй ч. на бурых лясных, вулканічных і забалочаных глебах густыя вечназялёныя лясы (гемігілея). На Пд ад 46° паўд. ш. мяшаныя лясы, на ўсх. раўнінах і ў раёне Магеланава праліва — стэпы. У складзе жывёльнага свету ў

Ціхаакіянскае ўзбярэжжа ў Сярэднім **Чылі**.

Ч Ы Л І
Маштаб 1:20 000 000
70° з.д.
20°
30°
40°
50°
КАЧАБАМБА
АРУРА
АРЫКА
ПІСАГУА
ІКІКЕ
УЮНІ
ТАКАПІЛЬЯ
АНТАФАГАСТА
ЛОС-В'ЯНТАС
ТАЛЬТАЛЬ
ЧАНЬЯРАЛЬ
КАЛЬДЭРА
ВАЛЬЕНАР
ЛА-СЕРЭНА
КАКІМБА
АВАЛЬ
САН-ХУАН
ВІНЬЯ-ДЭЛЬ-МАР
ВАЛЬПАРАІСА
САНТ'ЯГА
САН-АНТОНІО
РАНКАГУА
КУРЫКО
ТАЛЬКА
ЛІНАРЭС
МАЛАРГУЭ
САН-РАФАЭЛЬ
ТАЛЬКАУАНА
ЧЫЛЬЯН
ЛЕБУ
АНГОЛЬ
ВІКТОРЫЯ
ТЭМУКА
НЕЎКЕН
ПІТРУФКІН
ВАЛЬДЫВІЯ
АСОРНА
ПУЭРТА-МОНТ
АНКУД
ЭСКІЛЬ
ТРЭЛЬЮ
ЛАС-ПЛУМАС
ПУЭРТА-АЙСЕН
КАЙЯКА
КАМАДОРА-РЫВАДАВІЯ
ЛАС-ЭРАС
ПУЭРТА-ДЭСЕАДА
САН-ХУЛІЯН
ЛАГА-В'ЕДМА
САНТА КРУС
РЫО-ТУРБІЯ
ПУЭРТА-НАТАЛЕС
РЫО-ГАЛЬВАГАС
ПУНТА-АРЭНАС
ВОГНЕННАЯ ЗЯМЛЯ
УШУАЯ
ЧЫЛІ
6723 вул. Люльяльяко
6880 г. Охас-дэль-Салада
6960 г. Ананкагуа
6800 г. Тупунгато
5323 вул. Майпа
2660
2469
Паўднёвы тропік
Трапік Казерога
Падоўжная даліна
Прыбярэжны хрыбет
Заходнія Кардыльеры
Цэнтральная даліна
Усходнія Кардыльеры
Прыатлантычная нізіна
Нацыянальны парк Чыльян
Нацыянальны парк Вікунья
Нацыянальны парк Ланін
Нацыянальны парк Вулкан
Нацыянальны парк Вулканы
Нацыянальны парк Пэрыта-Морэна
Нацыянальны парк Торэс-дэль-Пайне
Нацыянальны парк Вогненная Зямля
Нацыянальны парк Алерсе
Нацыянальны парк Пуэрта-Домінга
Нацыянальны парк Вулканы
Нацыянальны парк Вулканы
Нацыянальны парк Вулканы

рай на армію. Гэтая канцэпцыя ўлады ўвасоблена ў Канстытуцыі Ч. 1833 (дзейнічала да 1925), паводле якой уся рэальная ўлада належала прэзідэнту, выбарчым правам валодалі толькі пісьменныя мужчыны. Да 1860-х г. чылійскія ўрады ў асн. працягвалі лінію Парталеса. У 1861—91 прэзідэнты-лібералы Х.Х.Перэс, Ф.Э.Саньярту, А.Пінта, Д.Санта-Марыя і Х.М.Бальмаседа імкнуліся дэмакратызаваць краіну: абмежаваны прывілеі землеўладальнікаў і царквы, скасаваны маёмасны цэнз пры выбранні на пасады, забаронена выбіраць адну асобу прэзідэнтам на 2 тэрміны запар. На эканоміку Ч. адмоўна паўплываў сусв. эканам. крызіс 1870-х г. Эканам. ўздыму паспрыяла далучэнне да Ч. ў выніку Ціхаакіянскай вайны 1879—83 пустыні Атакама з вялізнымі запасамі салетры і медзі. У грамадз. вайне 1891 прэзідэнт Бальмаседа быў пераможаны прыхільнікамі парламентарызму і да 1920-х г. Ч. фактычна была парламенцкай рэспублікай. Прэзідэнт А. Алесандры Пальма (1920—25) дамогся прыняцця Канстытуцыі

Да арт. **Чылі**. Касцёл Сан-Франсіска ў Сант'яга. 16—17 ст.

1925, якая абвясціла аддзяленне царквы ад дзяржавы, абавязковасць пачатковай адукацыі, падсправаздачнасць урада прэзідэнту; уведзена новае сац. і прац. заканадаўства, 8-гадзінны рабочы дзень. Прэзідэнт К. Ібаньес дэль Кампа (1927—31) забараніў дэмакр. арг-цыі і перадаў салетраную прам-сць капіталістам ЗША. Алесандры Пальма ў сваё 2-е прэзідэнцтва (1932—38) стабілізаваў падарваную сусв. крызісам эканоміку. Прапрэзідэнцкая Радыкальная партыя сумесна з камуністамі і інш. левымі сіламі стварыла Нар. фронт (1938—41), кандыдат якога П.Агірэ Серда стаў наступным прэзідэнтам (1938—41). Ён аднавіў дэмакр. свабоды і абвясціў праграму, падобную на «новы курс». Ф.Д.*Рузвельта*. Урады Агірэ Серды і наступнага прэзідэнта Х.А.Рыяса (1942—46) пабудавалі ў Ч. шэраг буйных прадпрыемстваў. У 2-ю сусв. вайну Ч. прытрымлівалася нейтралітэту і толькі ў 1945 абвясціла вайну Германіі (15 лют.) і Японіі (5 крас.). У пасляваен. гады капітал ЗША узяў пад кантроль горназдабыўную і шэраг інш. галін прам-сці Ч. Прэзідэнт Г.Гансалес Відэла (1946—52) прыйшоў да ўлады як кандыдат ад дэмакр. кааліцыі з удзелам камуністаў, але ў 1948 забараніў Камуніст. партыю. Выбраны зноў прэзідэнтам К.Ібаньес дэль Кампа (1952—58) увёў жорсткія антыінфляцыйныя захады, падавіў усеаг. забастоўку 1954—55, падпісаў ваен. пагадненні 1952 і 1956 з ЗША. Падобную палітыку працягваў прэзідэнт Х.Алесандры (1958—64).

Імкненне грамадства да сур'ёзных сац.-эканам. і паліт. перамен прывяло да выбрання прэзідэнтам хрысц. дэмакрата Э. Фрэя Мантальвы (1964—70), які паспяхова здзейсніў праграму дэмакратызацыі краіны, правёў агр. рэформу, нацыяналізацыю меднай прам-сці, рэфармаваў сістэму адукацыі. На прэзідэнцкіх выбарах 1970 перамог кандыдат блока «*Народнае адзінства*» сацыяліст С.*Альендэ Госенс* (1970—73), які імкнуўся да сацыяліст. пераўтварэння Ч. Ён нацыяналізаваў прыватныя банкі і меднарудную прам-сць, здзейсніў шэраг захадаў да паляпшэння жыцця працоўных. Аднак справакаваны непрадуманымі рэформамі эканам. крызіс выклікаў масавыя забастоўкі 1971—72 і дэстабілізаваў паліт. сітуацыю. У выніку ваен. пераварота ўрад «Нар. адзінства» 11.9.1973 скінуты (Альендэ загінуў, забіты сотні інш. людзей), да ўлады амаль на 17 гадоў прыйшла ваен. хунта на чале з ген. А.*Піначэтам Угартэ* (са снеж. 1974 прэзідэнт). Былі забаронены левыя паліт. партыі, прафсаюзы, забастоўкі, замест органаў самакіравання прызначаліся чыноўнікі. Толькі ў 1973—74 больш за 130 тыс. чал. кінуты ў турмы і канцлагеры, дзе многія загінулі. Піначэт дэнацыяналізаваў медназдабыўную і інш. галіны прам-сці, вызваліў прыватныя прадпрыемствы ад урадавага кантролю. Гэтыя захады і спрыяльная міжнар. эканам. кан'юнктура садзейнічалі прыцягненню замежных інвестыцый і ўздыму эканомікі Ч. У 1980 па выніках плебісцыту прынята новая канстытуцыя краіны, якая дазволіла Піначэту заставаць пасаду прэзідэнта яшчэ на 8 гадоў. У 1987 легалізаваны паліт. партыі. У 1988 Піначэт прайграў рэферэндум па працягванні свайго прэзідэнцтва. На выбарах 14.12.1989 прэзідэнтам краіны выбраны хрысц. дэмакрат П.Эйлвін Асакар. Ён і наступны прэзідэнт, таксама хрысц. дэмакрат, Э.Фрэй Руіс-Тагле (1994—2000) рабілі захады па дэмакратызацыі краіны і расследаванні злачынстваў ваенных, працягвалі ліберальны курс у эканоміцы, што забяспечыла яе ўстойлівы рост. У сак. 2000 прэзідэнтам выбраны б. вязень Піначэта сацыяліст Р.Лагас Эскабар, які асн. ўвагу аддае ўмацаванню законнасці ў краіне. Ч. — чл. ААН (з 1945), Арг-цыі амер. дзяржаў і інш. міжнар. арг-цый. Дыпламат. адносіны з Рэспублікай Беларусь устаноўлены 27.1.1992.

Палітычныя партыі і прафсаюзы. Хрысц.-дэмакр. партыя, Сацыяліст. партыя Ч., Камуніст. партыя Ч., Партыя за дэмакратыю, Радыкальная с.-д. партыя і інш. Асн. прафс. аб'яднанне — Аб'яднаны прафцэнтр працоўных.

Гаспадарка. Ч. — адна з найб. развітых краін Паўд. Амерыкі (2-е месца пасля Аргенціны паводле індэкса развіцця чалавечага патэнцыялу). Аб'ём валавога ўнутр. прадукту (ВУП) у 1998 склаў 184,6 млрд. дол. (12,2 тыс. дол. на душу насельніцтва). Дзяржава стымулюе прыватны сектар, падтрымлівае асн. макраэканам. прапорцыі, актыўна прыцягвае замежныя інвестыцыі кампаній ЗША, Зах. Еўропы, Паўд. Афр. Рэспублікі, суседніх краін. Вядучая галіна прамысловасці — гарнарудная, пераважна здабыча медзі. Разведаныя запасы медзі ацэньваюцца ў 162 млн. т (39,5% сусветных), здабыча ў 2001 склала 4,74 млн. т (35% сусв., 1-е месца ў свеце па здабычы і экспарце). Радовішчы медзі цягнуцца паласой 50—100 км ад мяжы з Перу праз пустыню Атакама да цэнтр. часткі Ч. на 1800 км. Дзярж. кампаніі «КАДЭЛКО» належаць буйныя горнаметалургічныя медна-малібдэнавыя камбінаты Эскандыда, Чукікамата, Радаміра-Томік, Эль-Сальвадор, Андына і інш. Здабыча (тыс. т, 2001) малібдэну 33,5, жал. руды 8500 (буйныя руднікі Рамераль, Альгароба, Бакерон-Чаньяр, Лос-Каларадас на Пн), марганцавых руд 40 (раён Ла-Серэна), салетры 1072 (1-е месца ў свеце па запасах; зах. ч.

Акт аб дзяржаўнай незалежнасці **Чылі**. 1818.

пустыні Атакама), спадарожнага ёду 330. У раёне Ікіке здабываюць каменную соль (6 млн. т), з салёных азёр Атакамы — літый, калій, бор, у высакагорнай ч. Андаў — золата (54 т; Эль-Індыо-Тамба) і серабро (1242 т, 2000, Чаньярсільё). Невял. запасы нафты (20 млн. т) і газу (24 млрд. м^3) на Пд краіны распрацоўвае дзярж. кампанія «ЭНАП» (270 тыс. т і 2,7 млрд. м^3 адпаведна). Здабыча каменнага вугалю 0,5 млн. т на Пд ад г. Кансепсьён і на в-ве Вогненная Зямля. У апрацоўчай прам-сці вылучаюцца харч. і лёгкая. Развіты цукр., мясахаладабойная, вінаробная, рыбаконсервавая галіны. Тэкст. і гарбарна-абутковая прам-сць у гарадах Вальпараіса, Сант'яга, Кансепсьён. Развіваюцца нафтаперапрацоўка і нафтахімія (Кансепсьён, Канкан, Манант'ялес), вытв-сць мінер. угнаенняў, сернай к-ты, соды, фарбаў, аўтамаб. шын (Вальпараіса, Сант'яга, Антафагаста). Каляровая металургія ў гарадах Чукікамата, Пайпотэ, Патрэрыльёс, Вальпараіса, Чагрэс, Калетонес; чорная — у Уачыпата (выплаўляецца 1 млн. т чыгуну і 1,3 млн. т сталі), машынабудаванне і металаапрацоўка — у Сант'яга, Вальпараіса, Кансепсьёне, Арыцы, Талькауана; дрэваапрацоўка і цэлюлозна-папяровая прам-сць — на Пд краіны. Вытв-сць электраэнергіі 35,8 млрд. кВт·гадз на ЦЭС (55%) і ГЭС (45%). Сельская гаспадарка з'яўляецца высокаінтэнсіўнай галіной. Апрацоўваецца 5% тэр. Развіты раслінаводства ўмеранага і субтрапічнага пояса (збожжавыя, садоўніцтва і вінаградарства). Гал. земляробчы раён — цэнтр. частка Ч.— схілы Берагавых Кардыльераў і Падоўжная даліна. Вырошчваюць (збор тыс. т, 1998) пшаніцу 1734, кукурузу 661, авёс 157, ячмень 82, рыс 162, бульбу 928, цукр. буракі, фасолю, тытунь. Жывёлагадоўля пераважае пашавая, развіта паўсюдна. Пагалоўе (тыс. галоў, 1998): буйн. раг. жывёлы 4140, свіней 1720, авечак 3710, коз 738. Птушкагадоўля. Вытв-сць мяса (ялавічыны і цяляціны) 266 тыс. т, малака 1150 тыс. т штогод. Улоў рыбы 6,69 млн. т (2-е месца ў Лац. Амерыцы), развіваецца промысел крабаў, амараў, вустрыц. Ч. цалкам забяспечвае сябе харчаваннем, шмат прадукцыі (свежая садавіна і агародніна, віно) экспартуецца. Развіты чыг., аўтамаб., марскі і паветр. транспарт. Даўж. чыгунак 8107 км, аўтадарог каля 80 тыс. км, у т.л. 10,5 тыс. км асфальтаваныя. Аўтапарк перавышае 900 тыс. аўтамабіляў. Танаж марскога флоту больш за 1,1 млн. брута-рэг. т, буйныя парты: Вальпараіса, Сан-Антоніо, Антафагаста, Пунта-Арэнас, Ікіке, Пуэрта-Монт. 23 аэрапорты. Экспарт (18 млрд. дол., 2000) медзі і меднай руды (40,5%), жал. руды і канцэнтрату, салетры і ёду, дрэваапр. прадукцыі, садавіны і агародніны, віна, рыбнай мукі. Імпарт (17 млрд. дол., 2000) машын і абсталявання, паліва, хім. тавараў. Асн. гандл. партнёры: ЗША (24% экспарту і 16% імпарту), краіны ЕС (23% і 27%), Азіі, Лац. Амерыкі. Даход ад турызму (1998) 1,06 млрд. дол. Грашовая адзінка — чылійскае песа.

Узброеныя сілы (2002). Уключаюць рэгулярныя ўзбр. сілы (80,5 тыс. чал.), рэзерв (50 тыс. чал.), ваенізаваныя фарміраванні (войскі карабінераў, 36,8 тыс. чал.). Вярх. галоўнакамандуючы — прэзідэнт. Камплектаванне паводле прызыву. Рэгулярныя ўзбр. сілы складаюцца з сухап. войск, ВПС і ВМС. У сухап. войсках 45 тыс. чал., 290 танкаў, 157 баявых разведвальных машын, больш за 650 бронетранспарцёраў, 20 баявых машын з цяжкім узбраеннем, 163 буксірныя гарматы, 440 мінамётаў, 150 безадкатных гармат, 62 пераносныя зенітныя ракетныя комплексы, 33 самалёты, 52 верталёты, у т.л. 5 баявых і інш. У ВПС 12,5 тыс. чал., 76 баявых самалётаў. У ВМС 23 тыс. чал., 3 падводныя лодкі, 3 эсмінцы, 3 фрэгаты, 7 ракетных катэраў, 6 патрульных караблёў, 3 танкадэсантныя караблі, 2 малыя дэсантныя караблі, 1 ледакол і інш.; у авіяцыі ВМС эскадрыллі самалётаў і верталётаў; у марской пяхоты танкі, бронетранспарцёры, гарматы і мінамёты; у берагавой ахове 1,3 тыс.чал., 41 патрульны катэр.

Асвета, навуковыя ўстановы. Сістэма адукацыі ўключае дашкольныя ўстановы, агульнаадук. і прафес. школы, сярэднія спец. і вышэйшыя навуч. ўстановы. Існуе абавязковая асн. адукацыя для дзяцей 6—15 гадоў. На базе асн. школы дзейнічаюць 4-гадовыя сярэднія агульнаадук. школы, 4-гадовыя прафес.-тэхн. школы і 4-гадовыя педвучылішчы. У пач. 21 ст. ў Ч. распачата рэформа сістэмы адукацыі. Паводле прынятага ў 2003 закона дзяржава гарантуе кожнаму члену грамадства абавязковую бясплатную 12-гадовую адукацыю. На ўсіх яе узроўнях існуюць дзярж. і прыватныя навуч. ўстановы. У 1975/76 навуч. г. ў Ч. дзейнічала 8 ун-таў (з іх 6 прыватных), у якіх навучалася больш за 100 тыс. студэнтаў. У выніку мадэрнізацыі сістэмы вышэйшай адукацыі на аснове закона аб адукацыі (1990) і дэкрэта аб дзярж. субсідыях у адукацыю (1993), у 1995 дзейнічалі 70 ун-таў з агульнай колькасцю студэнтаў амаль 300 тысяч. Буйнейшыя ун-ты: Чылійскі (з 1738; 8 тыс. студэнтаў), «Сант'яга дэ Чылі» (з 1947; 16 тыс. студэнтаў), Папскі каталіцкі ў Сант'яга (з 1888; 16 тыс. студэнтаў), Каталіцкі ў Вальпараіса (з 1928; 7 тыс. студэнтаў), ун-ты ў Кансепсьёне (з 1919; 11 тыс. студэнтаў), Вальдывіі (з 1954; 7 тыс. студэнтаў). З Чылійскім ун-там звязана жыццё і дзейнасць І.І.*Дамейкі*, які з 1838 жыў у Ч., з 1846 праф., у 1867—83 рэктар гэтага ун-та і ўпершыню арганізаваў там шырокае вывучэнне геалогіі і мінералогіі. Фінансаванне ВНУ дзяржаўна-прыватнае: існуе прамое і ўскоснае фінансаванне дзяржавай, матэрыяльная дапамога студэнтам праз стыпендыяльны фонд, фонды універсітэцкага крэдыту, сістэма прэзідэнцкіх стыпендый; 25

Да арт. **Чылі**. Касцёл у Парынакоце. 18 ст.

Да арт. **Чылі**. На адной з вуліц г. Сант'яга ў дні ваеннага перавароту. Верасень 1973.

ун-таў маюць прамое фінансаванне. Дзейнічае адзіная для ўсіх дзярж. ун-таў сістэма крэдытавання студэнтаў (крэдыт даецца малазабяспечаным студэнтам на 10—12 гадоў, які выпускнік у абавязковым парадку выплачвае — 5% ад свайго заробку — да пагашэння доўгу). У пач. 21 ст. сістэма адукацыі ў Ч. лічыцца найб. эфектыўнай і стабільнай у Лац. Амерыцы. Найбуйнейшая бібліятэка — Нац. б-ка Ч. ў Сант'яга (з 1813; больш за 2 млн. тамоў). Асноўныя музеі ў сталіцы Ч.: Нац. гістарычны, Нац. выяўл. мастацтва і музыкі, прыроднай гісторыі, сучаснага мастацтва, амер. нар. мастацтва. Навук. даследаванні вядуцца ў АН, навук. цэнтрах, н.-д. установах, на кафедрах ун-таў.

Друк, радыё, тэлебачанне. У 2002 у Ч. выдаваліся 52 штодзённыя газеты і інш. перыяд. выданні. Найбуйнейшыя агульнанац. газеты: «La Tercera» («Трэць гадзіны», з 1950), «Las Últimas Noticias» («Апошнія навіны», з 1902), «El Mercurio» («Меркурый», з 1827). Інфарм. агенцтвы — «Орбэ сервісіяс інфарматывас» (з 1953) і «Агенцыя Чылі натысіяс» (з 1993). Радыёвяшчанне з пач. 1920-х г. Агульнанац. грамадская радыёстанцыя «Радыё кааператыва» (з 1935). Вяшчаюць 316 радыёстанцый. Тэлебачанне з 1959. Найбуйнейшыя тэлеканалы: грамадскі «Нацыянальнае тэлебачанне Чылі» (з 1968; 145 тэлевізійных станцый), прыватныя каталіцкія «Тэлетрэсе» і «Тэлебачанне каталіцкага універсітэта Вальпараіса», камерцыйныя «Чылівіжн», «Ла рэд», «Мегавіжн». Дзейнасць тэлекампаній кантралюе Нац. савет па тэлебачанні (з 1992).

Літаратура. Развіваецца на ісп. мове. Першыя помнікі напісаны ісп. канкістадорамі П. дэ *Вальдывіяй* («Пісьмы пра адкрыццё і заваяванне Чылі», 1540—53) і А. дэ Эрсілья-і-Суньігай (паэма «Араўкана», 1569—89). У л-ры калан. перыяду (16—18 ст.) пераважалі гіст. аснова, эпічная героіка з элементамі крэольскага фальклору (творы А. дэ Авалье, Ф.Гомеса дэ Відаурэ, П. дэ Оньі). Пашырылася паэзія малых форм, пераважна сатыр. зместу (куплеты, эпіграмы, жартоўныя экспромты). У перыяд вайны за незалежнасць і станаўлення рэспублікі развівалася паліт. публіцыстыка (К.Энрыкес) і драматургія (Х.Эганья). Пошукі нац. самавызначэння вяліся ў рэчышчы рамантызму і кастумбрызму (Х.Х.Вальеха, Х.В.Ластарыя, Г.Мата, С.Санфуэнтэс). Складваўся крытычны рэалізм (цыклы раманаў Л.Арэга Лука, А.Блеста Ганы). У пач. 20 ст. зарадзіліся нац. мадэрнізм (паэзія А.Боркеса Солара, М.Магальянеса Моўрэ, К.Песоа Веліса, проза Э.Барыяса, П.Прада), мунданавізм (Ф.Кантрэрас), імажынізм (А.Д'Альмар). Літ. крэалізм з ідэяй фарміравання нац. характару прыродным асяроддзем выявіўся ў творчасці Ф.Ганы, М.Латорэ, В.Д.Сільвы. Адначасова распрацоўваліся тэмы горада, жыцця простых людзей (Н.Гусман, К.С.Лейтан, Х.Эдвардс Бельё). У 1920-я г. пачынаецца росквіт паэзіі Г.*Містраль*, П.*Нэруды*, В.Уйдобра. З сярэдзіны 20 ст. развівалася рэаліст. проза з сац. арыентацыяй і маст. эксперыментамі (Ф.Алегрыя, Х.Даноса, Ф.Калаане, Э.Лафуркод, М.Рохас). У 1990-я г. л-ру Ч. прадстаўлялі празаікі В.*Тэйтэльбойм*, І.Альендэ, Л.Сепульведа, М.Серана, А.Скармета, паэты М.Агасін, Х.Кесада, А.Лара, Н.Пара, драматургі І.Агірэ, С.Валдановік, Х.Дыяс, А.Сьевекінг. На бел. мове выдадзены творы Нэруды («Крыві бунтоўнай кроплі», 1976), Містраль («Ветраліст», 1984). Сярод перакладчыкаў на бел. мову Р.Барадулін, Г.Бураўкін, А.Вялюгін, С.Грахоўскі, А.Грачанікаў, Х.Жычка, М.Калачынскі, І.Калеснік, Г.Кляўко, А.Куляшоў, А.Лойка, Я.Семяжон, М.Танк, К.Шэрман і інш.

Да арт. **Чылі**. Х.Кабальера. Сціплы пейзаж.

Архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Ад стараж. мастацтва індзейцаў, звязанага з развітымі культурамі Перу, на тэр. Ч. захаваліся руіны крэпасцей, паселішчаў, размаляваная і фігурная кераміка, наскальныя малюнкі. Вылучаюцца гіганцкія каменныя скульптуры на в-ве Рапануі (Вялікадня). Індзейцы пустыні Атакама будавалі хаціны з каменю і кактусаў, паўд. далін — з ілу і каменю. Традыцыі стараж. мастацтва захаваліся ў нар. творчасці: драўляныя надмагільныя слупы індзейцаў араўканаў са схематычнымі фігурамі, ткацтва, ганчарства, апрацоўка серабра, размалёўка і разьба па дрэве. З 16 ст. будавалі фор-

Да арт. **Чылі**. Керамічны збан з г. Арыка. Культура Хентылар.

ты, гарады з прамавугольнай сеткай вуліц і цэнтр. плошчай, касцёлы, 1-павярховыя дамы з адобы (цэгла-сырэц з рэзанай саломай) з унутр. дворыкамі-патыо, парталамі і ўзорыстымі метал. кратамі на вокнах; узніклі рэліг. жывапіс і скульптура. У 18 — пач. 19 ст. будавалі ў стылях барока і класіцызму (арх. Х.Таэска-і-Рычы, М. дэ Хара Кемада), развіваліся жывапіс, скульптура, гравюра (А.Сантэлісес). У 1850 арх. К.Ф.Бруне дэ Бен заснаваў нац. арх. школу пры Чылійскім ун-це. Складзены план развіцця г. Сант'яга (1841—53), узведзены парадныя класіцыстычныя будынкі (Муніцыпальны т-р, 1853—73; Нац. кангрэс, 1876). У 2-й пал. 19 ст. сфарміравалася чылійская арх. школа (Х.Гандарыльяс, М.Альдунатэ, Ф.Вівасета і інш.); мастакі П.Ліра, М.А.Кара заклалі асновы нац. гіст. і пейзажнага жывапісу. Вылучаліся партрэтысты Ф.К.Мандзьёла, А.Гана. У 1938—42 рэканструяваны цэнтр Сант'яга, узведзены манум. грамадскія будынкі. З 1950-х г. вядзецца комплекснае буд-ва жылых раёнаў у прадмесцях вял. гарадоў. У 1960—70-я г. ўзводзілі вышынныя і сейсмаўстойлівыя будынкі. З 1980-х г. будуюць у сучасных стылях. У жывапісе і графіцы 20 ст. пашыраны розныя мадэрнісцкія плыні (К.Пероці, М.Кольвін), нарадзілася сацыяльна актыўнае рэаліст. мастацтва (графік К.Эрмасільля Альварэс, жывапісец і графік Х.Вентурэлы, скульпт. В.Арыяс, манументаліст і графік Х.Эскамес, жывапісцы М.Банта, Х.Кабальера); шматлікія брыгады насценнага жывапісу стваралі размалёўкі на быт., гіст. і інш. тэмы.

Музыка. Складаецца з індзейскай і крэольскай музыкі. Стараж. муз. культуру захоўваюць нашчадкі чылійскіх абарыгенаў араўканы: лірычныя, дзіцячыя, працоўныя, ваен., рытуальныя песні, разнастайныя танцы; муз. інструменты: ударныя (барабан культрун) і духавыя (трутрука, лалкінь). Характэрныя песенныя і песенна-танц. жанры нар. крэольскай музыкі — танада, куэка, рэфалоса, куандо; асн. муз. інструменты — гітара, арфа. Прафес. музыка развіваецца з 1810-х г. Створаны філарманічнае т-ва ў Сант'яга (1827), муз. школа (1849, з 1851 кансерваторыя). Муніцыпальны т-р («Тэатро мунісіпаль», 1857). Сярод кампазітараў 19 ст. — М.Роблес, З.Артыс дэ Саратэ (аўтар першай нац. оперы, 1895), Х.Сапіёла. Для кампазітарскай школы 1-й пал. 20 ст. характэрны 2 асн. кірункі: нац. (П.У.Альендэ Сарон, Р.Асеведа, К.Ісаміт, К.Лавін, Х.У.Урутыя Бландэль) і еўрап. з арыентацыяй на імпрэсіянізм, экспрэсіянізм, неакласіцызм і інш. (А.Катапас, Д.Санта-Крус Вільсан, Э.Сора, Х.Арэга Салас, К.Бота, К.Рыеска і інш.). У 1950-я г. вылучылася група «Тонус» з еўрап. авангардысцкай музыкай (заснавальнікі Э.Эйтлер, Ф.Фоке), у 1960-я г. — муз. рух «Новая песня»

(С.Артэга, А. і І. Пара, В.*Хара*). Адмоўна на муз. мастацтве адбілася панаванне ваен. хунты. На 2000 дзейнічаюць у Сант'яга: Сімф. (з 1941) і Муніцыпальны (з 1955) аркестры. Муніцыпальны т-р, Нац. балет (з 1945), Муніцыпальны балет (з 1959), хары «Арфеон», Чылійскага і Каталіцкага ун-таў, стр. квартэт Сант'яга (з 1954), фалькл. калектывы. Працуюць Нац. кансерваторыя, Ін-т павышэння муз. культуры пры Чылійскім ун-це (з 1940).

Тэатр. Вытокі тэатр. культуры Ч. ў абрадах і танцах індзейцаў, што насялялі краіну. Першыя тэатр. паказы ў 16 ст. наладжвалі святары-місіянеры. У 18 ст. з'явіліся спец. тэатр. будынкі, дзе выступалі ісп. акцёры. Ставіліся творы характэрных жанраў ісп. т-ра — лоа, танадылы, сайнеце, энтрэміш, п'есы Лопэ дэ Вэгі і інш. З пач. 19 ст. фарміруецца нац. драматургія (А.Асеведа Эрнандэс, Д.Барас Грэс). У 1930—40-я г. ў гарадах узніклі аматарскія тэатр. калектывы. У Сант'яга створаны Малы універсітэцкі т-р (1939), на аснове якога рэж. П. дэ ла Бара ў 1941 заснаваў Эксперым. т-р Чылійскага ун-та (у 1959 на яго базе створаны Тэатр. ін-т). У 1943 узнік Эксперым. т-р Каталіцкага ун-та, у 1946 — Незалежны т-р, які ўвёў у практыку сістэму К.Станіслаўскага. У 1950-я г. з'явіліся эксперым. т-ры ў філіялах Чылійскага ун-та, у г. Чыльян, Тэатр. аб'яднанне Вальпараіса, т-р Кансепсьёнскага ун-та, акцёры якога (У. і Э. Дзювашэлі, актрыса О.Эскамес) стварылі трупу «Куатро». Група дзеячаў з т-ра Каталіцкага ун-та заснавала камед. т-р «Іктус». У канцы 1960-х г. актрыса т-ра Каталіцкага ун-та А.Гансалес стварыла незалежную трупу «Эль Анхель». Калектывы «Куатро», «Інкус» і «Эль Анхель» свой рэпертуар будавалі на надзённым матэрыяле. У 1970-я г. вядучыя т-ры звярнуліся да сусв. класікі. Шырокае развіццё атрымаў аматарскі т-р. У 1969 створана Асацыяцыя аматараў т-ра. Самы вял. тэатр будынак — «Тэатра мунісіпаль» (з 1857). Сярод найбуйнейшых тэатр. дзеячаў дэ ла Бара, Д.Бенавентэ, А.Бюрле, А.Гансалес, М.Гансалес, Э.Пуэльма, М.Ксіргу, М.Малуэнда, П.Мартэйру, Э.Марцінес, Р.Парада, М.Партной, Р.Сатаканіль, В.Хара і інш. У рэпертуары т-раў Ч. канца 20 — пач. 21 ст. замежныя класічныя і сучасныя, а таксама чылійскія п'есы Асеведа Эрнандэса, А.Мука, Бараса Грэса, Ф.Куадры, Х.Лука Кручагі, Э.Бунстэра і інш.

Кіно. Першая чылійская кінастужка ў Ч. знята ў 1902. У 1900—1910-я г. ў Ч. здымаліся дакумент. фільмы, з 1917 пачаўся выпуск паўнаметражных ігравых фільмаў. У 1920-я г. працавалі рэжысёры Х.Бор, Х.Дэлана, К.Кар'ёла, П.Сьена. У 1934 зняты першы гукавы фільм «Поўнач і Поўдзень» (рэж. Дэлана). Сярод нац. фільмаў «Горкая праўда» (1945, рэж. К.Баркоске), «Праклятый крок» (1949, рэж. Ф.Матэр). К канцу 1940-х г. чылійскія фільмы выцесніла кінапрадукцыя ЗША. У 1950—60-я г. працавалі рэжысёры Бор, Дэлана, Э. дэ Міўора, М.Франк; у т.зв. «новым кіно» — А.Кавасевіч, П.Каўлен, М.Крамарэнка, М.Літын, Р.Руіс, Э.Сота, А.Франсія. У фільмах пач. 1970-х г. пераасэнсаванне і ўзнаўленне гісторыі краіны: «Канец гульні» (рэж. Л.Карнеха), «Аперацыя «Альфа» (рэж. Э.Артэга), «Адной малітвы мала» (рэж. Францыя), «Зямля запаветная» (рэж. Літын). У канцы 1970-х г. з-за паліт. падзей нац. кінапрам-сць паралізавана. За мяжой стваралася т.зв. чылійскае кіно супраціўлення: фільмы здымаліся ў СССР — «Ноч над Чылі» (1977 рэж. С.Аларкон, А.Косараў), «Падзенне Кандора» (1982, рэж. Аларкон), у Швецыі — «Я б хацела мець сына» (1973), на Кубе — «Знікнуўшыя вязні» (1979, абодва рэж. С.Кастылья), у Францыі і Балгарыі — «У Сант'яга ідзе дождж» (1975, рэж. Сота), у Нікарагуа — «Альсіна і Кандор» (1982, рэж. Літын). У канцы 1980-х г. з эміграцыі вярнуліся рэжысёры Г.Анселавіч, П.Гусман, Кастылья, Літын, Сота і інш. Склалася новае пакаленне рэжысёраў: І.Агуэра, Х.К.Бустамантэ, Т.Гавіёла, С.Каёці, Л.Какінг, К.Санчэс, Г.Хусцініяна. Сярод вядучых акцёраў Э.Беадле, Р.Бенавентэ, Н.Вільягра, А.Каэн, Л.Краксата, Л.Манса, Е.Муньёс. З 1990 у г. Вінья-дэль-Мар праводзіцца Міжнар. фестываль лацінаамер. кіно.

Да арт. **Чылі**. Каменныя скульптуры на востраве Рапануі.

Літ.: Очерки истории Чили. М., 1967; Бурстин Э. Чили при Альенде: взгляд очевидца: Пер. с англ. М., 1979; Хачатуров К.А. Латиноамериканские уроки для России. М., 1999; Культура Чили. М., 1968; Музыка стран Латинской Америки. М., 1983; Мамонтов С.П. Испаноязычная литература стран Латинской Америки в XX в. М., 1972; Алегрия Ф. Горизонты реализма: Пер. с исп. М., 1974.

І.І.Пірожнік (прырода, насельніцтва,гаспадарка), *В.А.Юшкевіч* (узброеныя сілы), *Н.Р.Кошалева* (гісторыя), *Л.У.Языкович* (асвета), *Л.А.Фядотаў* (друк, радыё, тэлебачанне), *І.Л.Лапін* (*літаратура*), *Г.У.Шур* (кіно).

ЧЫЛІБУ́ХА, ірвотны арэх (Strychnos nux-vomica), кветкавая расліна сям. лаганіевых. Трапляецца ў трапічных лясах Азіі і Паўн. Аўстраліі. Культывуецца ў тропіках Афрыкі.

Чылібуха.

Лістападнае дрэва выш. да 15 м. Лісце супраціўнае, авальнае, скурыстае, бліскучае. Кветкі дробныя, зеленавата-белыя, сабраныя ў парасонападобнае суквецце. Плод — ягадападобны з 2—8 цвёрдымі зярнятамі, ярка-аранжава-чырв. (т. зв. арэх), нагадвае памаранец Лек. сыравіна — зерне, мае 2—3% ядавітых алкалоідаў (пераважна бруцын і стрыхнін, якія ўваходзяць у склад стрэльнага яду *курарэ*). Выкарыстоўваецца ў медыцыне і ветэрынарыі.

ЧЫЛІ́ЙСКІ АРХІПЕЛА́Г, агульная назва некалькіх груп астравоў у Ціхім ак. каля паўд.-зах. берагоў Чылі. Найбуйнейшыя а-вы: *Чылаэ*, Уэлінгтан, Санта-Інес. Астравы мацерыковага паходжання (пераважна ўчасткі Берагавых Кардыльераў Андаў). Берагі моцна парэзаныя залівамі і пралівамі. Паверхня гарыстая, выш. да 1341 м. Частыя землетрасенні (наймацнейшае ў 1960). Лясы з нізкаслых паўд. букаў, балотная і лугавая расліннасць. Лесараспрацоўкі, рыбалоўства. Гал. горад і порт — Анкуд (на в-ве Чылаэ). Нац. парк Эрнанда-Магальянес.

ЧЫЛІ́ЙСКІ ЖО́ЛАБ, глыбакаводны жолаб у паўд.-ўсх. частцы Ціхага ак., уз-

доўж мацерыковага схілу Паўд. Амерыкі. Даўж. 2690 км, шыр. ад 30 да 90 км, макс. глыб. 8180 м. Уяўляе сабой шыўную зону паміж кантынент. і акіянічным тыпамі зямной кары.

ЧЫЛІ́ЙЦЫ (саманазва чыленьёс), народ, асн. насельніцтва *Чылі* (больш за 11,4 млн. чал.). Жывуць таксама ў Аргенціне (200 тыс. чал.), інш. краінах Амерыкі, краінах Еўропы, у Аўстраліі. Агульная колькасць 11,8 млн. чал. (1992). Гавораць на мясц. варыянце іспан. мовы. Вернікі — пераважна католікі.

ЧЫЛІ́М, род кветкавых раслін; тое, што *вадзяны арэх*.

ЧЫЛЬЯ́Н (Chillán), горад у Цэнтр. Чылі, у Падоўжнай даліне. Засн. ў 1580, горад з 1848. 159 тыс. ж. (1992). Гандл. цэнтр с.-г. раёна (агародніна, садавіна, вінаград, збожжавыя, жывёлагадоўля). Прам-сць: дрэваапрацоўчая, гарбарна-абутковая, вінаробная, харч., у т.л. мукамольная, маслабойная. Паблізу Ч. — гарачыя серныя крыніцы.

ЧЫ́МА ДА КАНЕЛЬЯ́НА (Cima da Conegliano) Джавані Батыста (каля 1459—1517 або 1518), італьянскі жывапісец эпохі *Адраджэння*. Вучыўся у Дж.*Беліні*. Зазнаў уплыў А. да *Месіна*, *Джарджоне*, ранняга *Тыцыяна*. Працаваў у Венецыі. Яго жывапіс вылучаецца характэрным для венецыянскай школы гучным залацістым каларытам, велічнай урачыстасцю кампазіцыі, паэт. адчуваннем сувязі чалавека з сусветам: «Мадонна са святымі» (1493), «Дабравешчанне» (1495), «Увядзенне ў храм» (каля 1500), «Мадонна з дзіцем і святымі Міхаілам і Андрэем» (каля 1505), «Апостал Пётр» (1516).

Чыма да Канельяна. Мадонна з дзіцем і святымі Міхаілам і Андрэем. Каля 1505.

ЧЫМАБУ́Э [Cimabue; сапр. Чэні ды Пена (Cenni di Peno); каля 1240 — пасля 1302], італьянскі жывапісец. Працаваў у Рыме, Асізі, Фларэнцыі, Пізе. Творчасць развівалася ў рэчышчы традыцый візант. жывапісу з рысамі протарэнесансу. Творы вылучаюцца велічнасцю кампазіцыі, матэрыяльнай адчувальнасцю твараў і фігур, унутр. значнасцю вобразаў: плоскаснасць і некат. схематычная сіметрычнасць спалучаюцца з вытанчанай стрыманасцю колеравай гамы, пластычнай яснасцю гнуткага контурнага малюнка: «Укрыжаванне», «Маэста» (абодва 1285), цыкл фрэсак у

Чымабуэ. Маэста. 1285.

Верхняй царкве Сан-Франчэска ў Асізі (каля 1290).

ЧЫМБАРА́СА (Chimborazo), патухлы вулкан у Зах. Кардыльеры Андаў. Выш. 6267 м (самая высокая вяршыня Эквадора). Складзены з андэзітаў. На схілах высакагорныя экватарыяльныя лугі — парамасы. Вышэй за 4700 м — шматгадовыя снягі, 14 ледавікоў.

ЧЫМБО́ТЭ (Chimbote), горад на З Перу, на *Панамерыканскай шашы*. 297 тыс. ж. (1990). Порт на Ціхім ак., паблізу вусця р. Санта. Буйны ц. рыбалоўства. Прам-сць: чорная металургія, рыбакансервавая, вытв-сць рыбнай мукі. Горад моцна пацярпеў ад землетрасення ў 1970.

ЧЫМГА́Н, горнакліматычны курорт ва Узбекістане ў даліне р. Чымганка (90 км ад Ташкента). Выш. над узр. м. 1400—1600 м. Клімат рэзка кантынент., лета цёплае (сярэдняя т-ра ліп. 20 °С). Асн. лек. фактар — горны клімат, спрыяльны для *клімататэрапіі* (для хворых на туберкулёз) і кліматапрафілактыкі. Праводзіцца таксама *кумысалячэнне*. Санаторый, дамы адпачынку, турбаза, гасцініца.

ЧЫМКЕ́НТ, горад, цэнтр Паўд.-Казахстанскай вобл. Казахстана, у міжрэчы Бадама і Сайрама (бас. р. Сырдар'я). Вядомы з 12 ст., 438,8 тыс. ж. (1995). Чыг. вузел. Прам-сць: хім. і нафтахім. (мінер. ўгнаенні, шыны), хім.-фармацэўтычная, машынабудаванне і металаапрацоўка (кавальска-прэсавае абсталяванне, электраапараты), каляровая металургія (свінец), лёгкая (баваўняная, апрацоўка каракулевых шкурак і інш.), харч., вытв-сць буд. матэрыялаў. ЦЭС. Канцавы пункт нафтаправода Омск—Ч. 3 ВНУ. 3 тэатры. Краязнаўчы музей.

ЧЫ́НА (Lathyrus), род кветкавых раслін сям. бабовых. Больш за 100 відаў. Пашыраны ва ўмераным поясе Еўразіі, у Афрыцы. У краінах Еўропы як харч. (клубні, лісце) вырошчваюць стараж. культуру Ч. клубняносную (L.tuberosus). На Беларусі 9 відаў. Найб. вядомыя Ч.: балотная (L. palustris), веснавая (L. vernus) лясная (L. sylvestris), лугавая (L. pratensis). У Чырв. кнігу занесены Ч. гарохападобная (L. pisiformis) і горная (L. montanus). Трапляюцца ў лясах, па берагах рэк, у хмызняках, на схілах яроў. Як дэкар. вырошчваюць Ч. пахучую, або пахучы гарошак (L.odoratus).

Адна- і шматгадовыя травяністыя расліны. Сцёблы прамастойныя, узыходныя, выш. да 1,5 м. Лісце пераважна аднапарнаперыстае, падоўжанае або ланцэтнае. Кветкі ў гронках або адзіночныя, на пазушных кветаносах. Плод — струк. У культуры большасць Ч. — кармавыя, у харч. мэтах (як *гарох*) вырошчваюць Ч. пасяўную (L.sativus). Харч., кармавыя, меданосныя, дэкар. расліны.

ЧЫНА́Б, рака ў Індыі і Пакістане, правы прыток р. Сатледж (бас. р. Інд). Даўж. каля 1100 км, пл. бас. 138 тыс. км^2. Пачынаецца з ледавікоў Зах. Гімалаяў, у межах Індыі цячэ ў глыбокай даліне; у Пакістане — па раўнінах Пенджаба. Асн. прытокі Джэлам (справа) і Раві (злева), ніжэй упадзення якой рака наз. Трымаб. Рэжым мусонны, летняе разводдзе. Сярэдні расход вады па выхадзе з гор 890 м^3/с, ніжэй ён памяншаецца за кошт забору вады арашальнымі каналамі. Даліна густа населена. На Ч. — г. Мултан (Пакістан).

ЧЫНА́РА, кветкавая расліна; гл. ў арт. *Платан*.

ЧЫНГІСІ́ДЫ, нашчадкі *Чынгісхана*, прадстаўнікі кіруючых дынастый у шэрагу краін Азіі і Усх. Еўропы, засн. яго сынамі: *Джучы*, *Джагатаем*, *Угедэем*, Талуем; унукамі, у т.л. *Батыем* (сынам Джучы). Гл. таксама *Мангольскія заваяванні*.

ЧЫНГІСХА́Н (уласнае імя Тэмуджын, Тэмучын; каля 1155, урочышча Дэлпун-Болдан на р. Анон, Манголія — каля 25.8.1227), стваральнік першай агульнамангольскай дзяржавы. У 1184—1205 разграміў большасць інш. манг. князёў, падпарадкаваўшы сабе асн. плямёны. У 1206 на курултаі (з'ездзе) манг. знаці абвешчаны вял. ханам над усімі плямёнамі з тытулам «Ч.» (ад цюрк. ценгіз — акіян, мора). Выдаў збор манг. законаў (яса), якія рэгулявалі жыццё плямёнаў, стварыў цэнтралізаваную сістэму дзярж. улады, падзяліўшы плямёны на ваен.-адм. адзінкі («тысячы»), кожная з якіх павінна была выстаўляць тысячу конных воінаў. Ім было створана самае масавае і баяздольнае па тым часе войска. У знешняй палітыцы імкнуўся да пашырэння тэр. дзяржавы. У 1207 нападам на дзяржаву *Сі-Ся* паклаў пачатак *мангольскім заваяванням* у 13 ст. У 1207—11 падпарадкаваў Усх. Туркестан, у 1211—15 вёў вайну з *чжурчжэнямі* за валоданне Паўн. Кітаем, захапіў Пекін і інш. буйныя гарады. У 1219 пачаў вайну з *Харэзмшахаў дзяржавай*, нанёс ёй шэраг цяжкіх паражэнняў, захапіў Сярэднюю Азію. Памёр у час паходу супраць тангуцкай дзяржавы Сі-Ся. Незадоўга да смерці падзяліў заваяваныя землі паміж сваімі нашчадкамі (гл. *Чынгісіды*).

Літ.: Кычанов Е.И. Жизнь Темучжина, думавшего покорить мир. М., 1973; Чингис-хан. СПб., 1998; Уолкер С.С. Чингизхан: Пер. с англ. Ростов на/Д, 1998.

В.У.Адзярыха.

ЧЫНДУ́ІН, Чындвін, рака на З М'янмы, правы, самы вял. прыток р. Іравадзі. Даўж. каля 1100 км, пл. бас. каля 114 тыс. км^2 (частка бас. на тэр. Індыі). Вытокі на зах. схілах гор Кумун. У верхнім і сярэднім цячэнні працякае па звілістай даліне, ніжэй — у межах шырокай міжгорнай катлавіны, дзе частка вады выкарыстоўваецца для арашэння. Рэжым мусонны з летнім разводдзем. Сярэдні расход вады больш за 4000 м^3/с. Суднаходная да вусця асн. прытока — р. Ую (больш за 600 км), у засушлівы сезон — на 400 км. На Ч. — г. Маўн'юа.

ЧЫНО́ЎНІЦТВА, асобая прывілеяваная праслойка насельніцтва, якая знаходзіцца на цывільнай дзярж. службе і спецыялізуецца на кіраванні і справаводстве. На Беларусі тэрмін «Ч.» ўвайшоў у сталы ўжытак у канцы 18 ст. пасля яе ўключэння ў склад Рас. імперыі ў выніку 3 падзелаў Рэчы Паспалітай. У гэты час на Беларусі сфарміравалася дзярж. *бюракратыя* як асобная сац. група, арганізаваная на рацыянальных прынцыпах падзелу працы з адпаведнай спецыялізацыяй і вызначанай сферай паўнамоцтваў, са строгай іерархіяй службовых месцаў і пасад, з фармалізаванай сістэмай правіл, інструкцый і спец. прынцыпамі прасоўвання па службовай лесвіцы.

У 1-й трэці 19 ст. большасць чыноўніцкага корпуса на Беларусі фарміравалася пераважна з выхадцаў з мясц. дробнай шляхты. Вышэйшыя і найб. адказныя пасады на губернскім узроўні займалі прысланыя з рас. губерняў чыноўнікі высокага рангу або мясц. буйныя землеўладальнікі. Пасля падаўлення *паўстання 1863—64* склад дзярж. апарата на Беларусі радыкальна абноўлены за кошт асоб рус. паходжання. Сярод прыбылых на Беларусь чыноўнікаў пераважалі разначынцы. З разрастаннем дзярж. апарата стаў пашырацца доступ у яго выхадцам з мясц. сялянства. Пасля 1917 тэрмін «Ч.» страціў афіц. значэнне і практычна выйшаў з ужытку. Спосабы арганізацыі рас. Ч. скапіраваны з зах.-еўрап. узораў, пераважна з прускага. У 1722 Пётр I увёў *Табель аб рангах* — сістэму чыноў і рангаў, паводле якой існавалі 14 класаў, што адпавядалі вызначаным штатным пасадам. Заняць пасаду ў сістэме дзярж. кіравання было немагчыма, калі кандыдат не быў чыноўнікам, г.зн. не меў класнага чыну. *С.М.Токць.*

ЧЫНШ (польск. czynsz ад лац. census перапіс), 1) у Зах. Еўропе ў перыяд феадалізму натуральныя і грашовыя плацяжы феад.-залежнага насельніцтва (пераважна сялян) зямельнаму ўласніку за карыстанне зямлёй на *чыншавым праве*. 2) Грашовая рэнта ў Беларусі і Літве ў 15 — 1-й пал. 19 ст., адна з асн. форм феад. зямельнай рэнты — аброку. Ч. узнік з развіццём таварна-грашовых адносін як асн. форма рэнты ў 16—18 ст. пераважна на У Беларусі. Быў асн. павіннасцю *чыншавых сялян*, асадных, кунічных і аброчных сялян. Як дадатковую павіннасць Ч. плацілі і інш. феад.-залежныя сяляне. У 1-й пал. 19 ст. называўся грашовым аброкам.

М.Ф.Спірыдонаў.

ЧЫ́НШАВАЕ ПРА́ВА, сістэма прававых норм, якія рэгулявалі часовае або бестэрміновае землекарыстанне сялян і мяшчан (чыншавікоў) у феад. грамадстве. Паводле Ч.п. феадалы-землеўласнікі перадавалі сваю зямлю ў спадчыннае карыстанне за вызначаную плату — *чынш*. Землеўласнік не меў права пазбавіць чыншавіка карыстання зямлёй, калі апошні несвоечасова плаціў чынш, аднак мог спагнаць яго ў прымусовым парадку. Феадалы часта павялічвалі чынш, самаўладна ўводзілі дадатковыя паборы і павіннасці (за карыстанне млынамі, мастамі і інш.). Ч.п. ўзнікла ў Зах. Еўропе ў 14—16 ст., з 15 ст. пашырана ў ВКЛ (гл. *Чыншавыя сяляне*, *Чыншавая шляхта*). У Рас. імперыі чынш (*аброк*) захоўваўся да сял. рэформы 1861 і адмены плацяжоў часоваабавязаных сялян у 1883.

ЧЫ́НШАВАЯ РЭФО́РМА, рэформа *чыншавых сялян* Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны, праведзеная царскім урадам паводле закона ад 9.6.1886. Чыншавыя пазямельныя адносіны ў

Чына пасяўная.

сельскай мясцовасці гэтых рэгіёнаў былі ліквідаваны. Чыншавікоў пераводзілі на абавязковы выкуп. Выкупныя плацяжы іх былі, як правіла, вышэйшыя за плацяжы б. панскіх сялян. Пазыка за некат. выключэннямі выдавалася ў поўным аб'ёме. Чыншавікі захоўвалі за сабой сервітутнае права (гл. *Сервітуты*). Для доказу права на спадчынную арэнду зямлі яны павінны былі падаць пэўныя дакументы ці паказанні сведак. Чыншавікі, якія даказалі арэндныя правы на займаемыя імі зямельныя ўчасткі, па добраахвотнай згодзе з памешчыкамі маглі на працягу 3 гадоў выкупіць іх або замяніць чыншавае трыманне простай арэндай. Чыншавікоў-мяшчан, якія перайшлі на выкуп, прыпісвалі да валасцей. Чыншавых правоў былі пазбаўлены арандатары, якія не мелі адпаведных дакументаў ці не падалі паказанняў сведак на спадчыннае карыстанне зямлёй, а таксама чыншавікі, што карысталіся ёй толькі на працягу апошніх 10 гадоў да рэформы 1886. Арандатараў, пазбаўленых гэтых правоў, памешчыкі зганялі з зямлі або замянялі чыншавае трыманне часовай арэндай. На Беларусі, у Літве і на Правабярэжнай Украіне з 58 тыс. чыншавікоў, якія атрымалі права выкупу, нават на канец 1903 больш за палову не выкарысталі яго. Да 1898 у 5 зах. губернях з 21 238 прашэнняў чыншавікоў ранейшыя правы на зямлю пав. чыншавыя камісіі прызналі толькі ў 3479 (16,4%) выпадках. Пераважная большасць чыншавікоў была пазбаўлена арандаваных імі зямельных угоддзяў.

Літ.: Панютич В.П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861—1900 гг. Мн., 1990. *В.П.Панюціч.*

ЧЫ́НШАВАЯ ШЛЯ́ХТА, група дробнамаянткавай *шляхты* Беларусі, Украіны і Літвы ў 16—19 ст. Спадчыннай зямлі яна не меда, а арандавала за грашовы *чынш* у дзяржавы ці буйных землеўласнікаў (магнатаў). Звычайна заключала з уласнікам вусную дамову аб арэндзе на тэрмін ад 1 да 15 гадоў. Фармальна належала да прывілеяванага саслоўя: мела асабістую недатыкальнасць, не падлягала ваенна-дарожным павіннасцям, мела права голасу на соймiках. У 1795—99 на ўсіх землях, далучаных да Рас. імперыі, складала 148 443 чал. мужч. полу з 218 025 чал. усёй шляхты. Для абмежавання доступу Ч.ш. ў дваранства рас. ўрад з канца 18 ст. праводзіў *разбор шляхты*. Значная частка Ч.ш. да 2-й пал. 19 ст. пераведзена ў саслоўі сялян і мяшчан. *Я.К.Анішчанка.*

ЧЫ́НШАВЫЯ СЯЛЯ́НЕ, у перыяд феадалізму сяляне, якія карысталіся спадчыннай зямлёй часова або бестэрмінова, за што плацілі натуральныя і грашовыя плацяжы (*чынш*). У 15 — 1-й пал. 19 ст. Ч.с. на Беларусі, Украіне і ў Літве — феад.-залежныя сяляне, гал. формай феад. павіннасцей якіх быў чынш. Ва *«Уставе на валокі» 1557* Ч.с. наз. і *асаднымі сялянамі*. Ч.с. выконвалі і дадатковыя павіннасці (*дзякла, талака, згоны*). З развіццём *фальваркаў* колькасць Ч.с. мянялася: у выпадку патрэбы феадалы пераводзілі іх у катэгорыю *цяглых сялян* і наадварот; павялічваліся і памеры чыншу. Найб. колькасць Ч.с. была ў 2-й пал. 17 — 1-й пал. 18 ст. У 1-й пал. 19 ст. Ч.с. наз. аброчнымі сялянамі, большасць іх пераведзена ў разрад паншчынных.

Літ.: Гісторыя сялянства Беларусі: У 3 т. Т. 1. Мн., 1997. *М.Ф.Спірыдонаў.*

ЧЫП (ад англ. chip абломак, асколак), выразаная частка (фрагмент) падложкі, у аб'ёме ці на паверхні якой сфарміраваны элементы *інтэгральнай схемы*, асобныя электронныя зборкі, кантактныя пляцоўкі і інш. У якасці падложак выкарыстоўваюць паўправадніковыя і дыэлектрычныя крышталі, кераміку, сіталы і інш. матэрыялы.

ЧЫ́ПЕНДЭЙЛ (Chippendale) Томас (хрышчаны 5.6.1718, Отлі, графства Йоркшыр, Вялікабрытанія — пахаваны 13.11.1779), англійскі майстар мэблі.

Т.Чыпендэйл. Крэсла. 1745.

Каля 1738 пасяліўся ў Лондане. Выраблял ў мэблю з чырв. дрэва. Стварыў арыгінальны «стыль Ч.», у якім аб'яднаў функцыян. мэтазгоднасць, зручнасць форм, выразнасць структуры прадмета з вытанчанасцю ліній і мудрагелістым дэкорам, спалучыў матывы кіт. мастацтва, готыкі і ракако. У 1754 выдаў альбом узораў мэблі.

«ЧЫРВАНАБРО́ВЫХ» ПАЎСТА́ННЕ, адно з найб. буйных паўстанняў у Кітаі ў 17—27 н.э. Паўстанцы фарбавалі бровы ў чырвоны колер (адсюль назва). Выклікана цяжкім становішчам народа, якое пагоршылася ў час праўлення *Ван Мана* і голаду ў выніку паводкі. Пачалося ў прав. Шаньдун пад кіраўніцтвам селяніна Фань Чуна. Паўстанцы (сяляне, наёмныя рабочыя, рабы) у 21 разгромілі ўрадавыя войскі і пачалі наступленне на сталіцу імперыі Чан'ань. Адначасова на сталіцу наступалі атрады прадстаўніка дынастыі *Хань* Лю Сюаня, які імкнуўся захапіць уладу. У 23 атрады Лю Сюаня занялі Чан'ань. Ван Ман быў забіты, Лю Сюаня абвясцілі імператарам пад імем Гэншы. У 25 атрады «чырванабровых» разбілі войскі Гэншы і абвясцілі імператарам пастуха Лю Пэнцзы. У 27 паўстанцы былі разгромлены войскамі прадстаўніка арыстакратыі Лю Сю (у 25 прыняў тытул імператара пад імем Гуан Удзі), з царавання якога пачалося праўленне новай галіны дынастыі Хань — Позняя Хань.

ЧЫРВАНАБУ́ДСКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1926—27. Утвораны 8.12.1926 у *Гомельскай акрузе*. Цэнтр — г.п. *Церахоўка*. Падзяляўся на 18 сельсаветаў. 4.8.1927 раён скасаваны, яго тэр. ўключана ў нанава ўтворaны *Церахоўскі раён*.

ЧЫРВАНАЗЁМЫ, тып *глеб*, які ўтвараецца пад шыракалістымі лясамі вільготных субтропікаў і часткова пад трапічнымі саваннамі ва ўмовах прамыўнога воднага рэжыму. Для іх характэрны яркая чырванаватая ці аранжавая афарбоўка, высокая наяўнасць аксідаў жалеза і алюмінію, нізкая крэменязёму і асноў, добрая гумуснасць (6—9%), але збедненасць пажыўнымі рэчывамі, кіслая ці слабакіслая рэакцыя глебавага раствору. Выкарыстоўваюцца для вырошчвання чаю, тытуню, цытрусавых культур, вінаграду. Пашыраны ў Грузіі, Італіі, Іспаніі, Азербайджане, Кітаі, Японіі, В'етнаме, ЗША, Бразіліі, Аўстраліі, Афрыцы.

ЧЫРВАНАФЛО́ЦЕЦ, воінскае званне радавога саставу ВМФ СССР са студз. 1918. Як персанальнае званне ўведзена паводле пастановы ЦВК і СНК ад 22 вер. 1935. У ліст. 1940 уведзена званне старшага Ч. У ліп. 1946 гэтыя званні заменены званнямі *матрос* і *старшы матрос*.

ЧЫРВАНАЦЕ́ЛЬЦАВЫЯ КЛЯШЧЫ́, чырванацелкі, трамбікулідзы (Trombiculidae), сямейства трамбідыформных кляшчоў. Больш за 2 тыс. відаў. Паразіты млекакормячых жывёл, чалавека, птушак, паўзуноў і земнаводных. На Беларусі 4 віды Ч.к.: гірсутыела Захваткіна (Hirsutiella zachvatkini), аскашэнгастыя Латышава (Ascoschoengastia latyshevi), неатрамбікулы асенняя (Neotrombicyla autumnalis) і Дубініна (N. dubinini).

Даўж. да 3 мм. Цела ярка-чырв., аранжавае або жоўтае, густа ўкрытае шчацінкамі. Ногі 7-членікавыя з 2 кіпцюркамі. Яйцакладныя. У развіцці праходзяць стадыі яйца, лічынкі і німфы. Цела лічынак чырв., авальнае, несегментаванае. Кормяцца насякомымі і іх яйца-

мі, лічынкі — паразіты. Іл. гл. да арт. *Клящы.* *С.Л.Максімава.*

ЧЫРВОНААРМЕ́ЕЦ, воінскае званне радавога саставу ў сухап. войсках і ВПС РСЧА са студз. 1918. Як персанальнае званне ўведзена паводле пастановы ЦВК і СНК ад 22 вер. 1935. У ліп. 1946 заменена званнем *радавы*.

ЧЫРВОНАБЯРЭ́ЖСКАЯ СЯДЗІ́БА, помнік сядзібна-паркавай архітэктуры канца 19 ст. ў в. Чырвоны Бераг Жлобінскага р-на Гомельскай вобл. Размешчаны на беразе р. Дабасна. Належала ген.-лейтэнанту М.С.Гатоўскаму, з 1891 — В.А.Козел-Паклеўскаму. Уключае сядзібны дом, флігель, уязную браму, гасп. пабудовы, парк. Тэр. сядзібы (11 га) абнесена высокай цаглянай агароджай. Цэнтр кампазіцыі — мураваны Г-падобны ў плане 2-павярховы сядзібны дом у стылі мадэрн з мансардавым і 2-схільным дахамі. Пабудаваны ў 1890—93 паводле праекта арх. К.Шрэтэра. Мае асім. шматпланавую кампазіцыю, засн. на спалучэнні асн. прамавугольнага ў плане аб'ёму і папярочнага корпуса, які выступае на гал. фасадзе рызалітам. На фасадах вылучаюцца 2—5-гранныя руставаныя эркеры з контрфорсамі і шатровымі гранёнымі завяршэннямі. Гал. ўваход вырашаны манум. тэрасай на масіўных пілонах са стральчатымі арачнымі праёмамі паміж імі. Вадазлівы афармлены ў выглядзе хімер (чыгуннае ліццё). Гарыз. падзел будынка на 2 ярусы выразна падкрэслены арнаментамі і дэкорам міжпавярхавага пояса і карніза. Каларыстычнае вырашэнне засн. на кантрасце пабеленых дэкар. элементаў і чырв. цаглянай муроўкі. Падобнае арх. вырашэнне мае 1-павярховы мураваны флігель з асім. аб'ёмна-прасторавай кампазіцыяй. Гал. ўезд у сядзібу вылучаны брамай у стылі неаготыкі ў выглядзе стральчатай аркі, дэкарыраванай аркатурай, 8-граннымі бакавымі вежамі. У будынках Ч.с. размешчаны *Чырвонабярэжскі аграрны каледж*. Парк (пл. 10 га) пейзажнага тыпу (з садам) закладзены ў канцы 19 ст. на месцы б. рэгулярнага парку (захаваўся баскет, перароблены ў ландшафтную паляну). У зах. ч. — пладовы сад, у паўд. і ўсх. — замкнёны паркавы ландшафт з сядзібным домам у цэнтры, які павернуты гал. фасадам да ракі, курцінамі вакол дома і на беразе ракі. Каля парку размяшчаюцца свіран і стайня. Іл. гл. таксама да арт. *Жыллё*.



Чырвонабярэжская сядзіба. Схема планіроўкі парку.

ЧЫРВОНАБЯРЭ́ЖСКІ АГРА́РНЫ КАЛЕ́ДЖ. Засн. ў 1921 у пас. *Чырвоны Бераг* Жлобінскага р-на Гомельскай вобл. як с.-г. тэхнікум. З 2002 сучасная назва. Спецыяльнасці (2002/03 навуч. г.): землеўпарадкаванне; аграномія; аграхімія, насенняводства і ахова раслін; рамонтна-абслуговая вытв-сць у сельскай гаспадарцы (спецыялізацыя — тэхн. эксплуатацыя трактароў, аўтамабіляў і самаходных с.-г. машын); кіраванне ў АПК. Прымае асоб з базавай і сярэдняй адукацыяй. Навучанне дзённае і завочнае.

ЧЫРВОНАБЯРЭ́ЖСКІ КРУХМА́ЛА-ПА́ТАЧНЫ ЗАВО́Д. Створаны ў в. *Чырвоны Бераг* Жлобінскага р-на Гомельскай вобл. ў 1931. Меў цэхі цёрачны і патачны. У Вял. Айч. вайну абсталяванне вывезена ў Германію, а цэхі пераабсталяваны пад перапрацоўку коксагызу на каўчук (1941—44). У 1948 адноўлены крухмальны, у 1951 — патачны цэхі. З 1994 адкрытае акц. т-ва. Асн. прадукцыя (2002) — патака крухмальная карамельная.

ЧЫРВОНАВАЛЛЁВІК (Calidris testacea, або C. ferruginea), птушка сям. бакасавых атр. сеўцападобных. Пашыраны ў Паўн. Азіі. На Беларусі рэдкі пралётны від.

Даўж. да 23 см, маса да 91 г. Знешне падобны на *чорнаваллёвіка*. Анярэнне спіны цёмна-бурае з рыжымі плямкамі. Шчокі, шыя і брушка каштанава-рыжыя, падхвосце белае. Дзюба амаль чорная, доўгая, крыху загнутая ўніз. Нясе 4 яйцы. Корміцца жукамі,

Чырвонаваллёвік.

насякомымі і іх лічынкамі, чарвямі, малюскамі, радзей — насеннем. *Э.Р.Самусенка.*

«ЧЫРВО́НАГА КРЫ́ЖА» Беларускае таварыства, нацыянальнае, недзярж. добраахвотнае грамадскае т-ва, якое аказвае дапамогу ахвярам узбр. канфліктаў і катастроф, адзінокім, інвалідам і састарэлым, удзельнічае ў арганізацыі дапамогі насельніцтву ў экстрэмальных сітуацыях, у т.л. ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

Першае на Беларусі т-ва апекі параненых і хворых у ваен. час існавала ў 1866—87. Як т-ва «Ч.К.» існуе на Беларусі з 1921. У 2-й пал. 1940-х г. яго санітарна-эпідэміял. атрады ўдзельнічалі ў абеззараджванні тэр., ліквідацыі і прафілактыцы брушнога тыфу. Пад апекай т-ва знаходзіліся ўсе дзіцячыя дамы, арганізоўваліся лагеры для дзяцей-сірот. З 1960-х г. патранажныя сёстры т-ва «Ч.К.» даглядалі інвалідаў Вял. Айч. вайны, у 1960—80 сан. інспектары і сан. дружыннікі значна павысілі сан. культуру, прафілактыку захворванняў і добраўпарадкаванне населеных месц. У 1991 Бел. т-ва «Ч.К.» (назва з 1994) стала недзярж. арг-цыяй. Яго вышэйшы орган—з'езд (1 раз у 5 гадоў), паміж з'ездамі кіруе Рэсп. к-т Бел. «Ч.к.», які ў пач. 2000-х г. меў у падпарадкаванні 6 абл., 179 гар. і раённых арг-цый, Дарожжы к-т «Ч.-к.» У 1995 т-ва Беларусі прызнана 168-м членам Міжнар. руху «Ч.К.» і «Чырвонага Паўмесяца». Працуе па праграмах: «Служба міласэрнасці», «Чарнобыль», «Служба катастроф», «Донарства», «Бежанцы» і інш. Гл. таксама арт. *«Чырвоны Крыж»*. *Э.А.Вальчук.*

ЧЫРВОНАГАЛО́ВІК, шапкавы грыб; тое, што *падасінавік*.

ЧЫРВОНАГАЛО́ВЫ НЫРЭ́ЦЬ, птушка сям. качыных; гл. ў арт. *Нырцы*.

ЧЫРВОНАГВАРДЗЕ́ЙСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА, Міхайлава. У Пухавіцкім р-не Мінскай вобл., каля в. Міхайлава. Створана ў 1988. Пл. 0,8 км^2, даўж. 1,7 км, найб. шыр. 800 м, найб. глыб. 8 м, аб'ём вады 3,4 млн. м^3. Наліўное. Напаўняецца вадой з р. Цітаўка пры дапамозе помпавай станцыі. Ваганні ўзроўню вады на працягу года да 4,4 м. Выкарыстоўваецца для арашэння с.-г. угоддзяў, рыбагадоўлі, воднага добраўпарадкавання прылеглых вёсак.

ЧЫРВО́НАЕ, вёска ў Жыткавіцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 20 км на Пн ад горада і чыг. ст. Жыткавічы, 240 км ад Гомеля. 1513 ж., 30 адна- і 27 шматпавярховых будынкаў (2003). Філіял буд.-мантажнага ўпраўлення № 8 трэста «Белпалівабуд», торфапрадпрыемства «Жыткавіцкае», прадпрыемства «Рытмбудсервіс», акц. т-ва «Нафтасорб». Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЧЫРВО́НАЕ ВО́ЗЕРА, Князь-возера, Чырвонае Палессе. У

Жыткавіцкім р-не Гомельскай вобл., у бас. р. Прыпяць, за 19 км на ПнУ ад г. Жыткавічы, каля в. Ляхавічы. Пры ўзроўні 136,4 м пл. люстра 43,79 км^2 (3-е па плошчы возера на Беларусі), даўж. 12,1 км, найб. шыр. 5,2 км, найб. глыб. 4 м, даўж. берагавой лініі 30,8 км. Пл. вадазбору 280 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу, авальная, злёгку выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Зах. схілы катлавіны спадзістыя, зліваюцца з прылеглымі асушанымі балотамі, паўд. — асобныя пясчаныя ўзгоркі, паўн. і ўсх. павышаюцца да 20—25 м. Берагі нізкія, тарфяністыя. Дно сподкападобнай формы, .сапрапелістае (сапрапель здабываюць на ўгнаенне), уздоўж паўн.-ўсх. і паўд.-зах. берагоў пясчанае і пясчана-ілістае. 5 астравоў агульнай пл. 0,06 км^2. Ледастаў з канца ліст. да канца сак. — пач. красавіка. Адзначаецца пастаянны дэфіцыт кіслароду, высокая колернасць вады, зімой здараюцца заморы рыбы. Зарастае вельмі слаба. Упадаюць некалькі каналаў, у т.л. Восаўскі, Дубрава і Чырвонаазёрскі, р. Дземенка; выцякаюць каналы Азёрны, Жыткавіцкі і Марохараўскі. Выкарыстоўваецца ў рыбагаспадарчых і рэкрэацыйных мэтах, як крыніца вады на арашэнне.

ЧЫРВО́НАЕ ВО́ЗЕРА. У Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Ушача, за 24 км на ПдЗ ад Полацка, за 2 км на ПдЗ ад в. Блізніца. Пл. 0,2 км^2, даўж. 780 м, найб. шыр. 350 м, даўж. берагавой лініі 2 км. Пл. вадазбору 2,75 км^2. Катлавіна выцягнутая з ПдЗ на ПнУ, складаецца з 2 плёсаў. Схілы катлавіны выш. да 5 м, пад лесам. Бяссцёкавае.

ЧЫРВО́НАЕ ЗРУШЭ́ННЕ, павелічэнне рэгіструемых назіральнікам даўжынь хваль $\lambda_н$ эл.-магн. выпрамянення ў параўнанні з іх значэннямі $\lambda_к$ ва ўласнай сістэме адліку крыніцы выпрамянення; зрушэнне ліній у бок чырвонай часткі спектра.

Узнікае ў выніку *Доплера эфекту* ці *гравітацыйнага зрушэння*. Характарызуецца велічынёй $z = (\lambda_н - \lambda_к)/\lambda_к$. Абумоўленае эфектам Доплера Ч.з. ўзнікае пры аддаленні крыніцы выпрамянення ад назіральніка (прыёмніка). У прыватнасці, з-за *расшырэння Сусвету* ў спектрах галактык і квазараў назіраецца касмалагічнае Ч.з. Рэкорднае (2002) вымеранае значэнне z для квазараў складае 6,28, для галактык — 6,56. Найбольшае касмалагічнае Ч.з. мае *рэліктавае выпрамяненне*. Гравітацыйнае Ч.з. ўзнікае, калі прыёмнік знаходзіцца ў вобласці з меншым гравітацыйным патэнцыялам, чым крыніца выпрамянення. Яно назіраецца ў спектрах Сонца і інш. зорак. У 1959 упершыню было вымерана Ч.з., выкліканае гравітацыйным полем Зямлі.

М.М.Касцюковіч.

ЧЫРВО́НАЕ МО́РА, міжкантынентальнае мора Індыйскага ак., паміж Афрыкай і Аравійскім п-вам (Паўд.-Зах. Азія). Абмывае берагі Егіпта, Судана, Эфіопіі, Ізраіля, Іарданіі, Саудаўскай Аравіі і Емена. Злучана з Індыйскім ак. Баб-эль-Мандэбскім пралівам, з Міжземным м. — Суэцкім каналам. Даўж. 1932 км, шыр. да 305 км. Пл. каля 460 тыс. км^2. Найб. глыб. 3039 м. Берагі парэзаны слаба. Залівы Суэцкі і Акаба (на Пн) раздзелены Сінайскім п-вам. Найб. в-аў — Дахлак. Прылівы паўсутачныя (да 0,6 м). Ч.м. — адно з самых цёплых (да 32 °С) і салёных (38—42‰) мораў. Праз Ч.м. самы кароткі марскі шлях з Еўропы ў Азію і Аўстралію. Рыбалоўства, здабыча каралаў, жэмчугу. Гал. парты: Суэц (Егіпет), Порт-Судан (Судан), Масаўа (Эфіопія), Джыда (Саудаўская Аравія), Хадэйда (Емен). Мяркуецца, што Ч.м. атрымала сваю назву ад прысутнасці ў ім вял. колькасці водарасцей (Frishodesmium erythraeum), скопішчы якіх надаюць вадзе чырванаваты колер.

ЧЫРВО́НАЙ А́РМІІ ПАХО́Д У ЗАХО́ДНЮЮ БЕЛАРУ́СЬ І ЗАХО́ДНЮЮ УКРАІ́НУ 1939, увод сав. войск на тэр. *Заходняй Беларусі* і Зах. Украіны, які пачаўся 17.9.1939 і паклаў пачатак іх уз'яднанню з СССР. Паводле ўмоў *Рыжскага мірнага дагавора 1921* зах.-бел. і зах.-ўкр. землі знаходзіліся ў складзе Польшчы. У ходзе *польскай кампаніі 1939* герм. войскі акупіравалі большую частку тэр. Польшчы (да 16 вер. акружылі Варшаву). У гэтых умовах сав. ўрад прыняў рашэнне «ўзяць пад сваю абарону жыццё і маёмасць насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі», як было сказана ў ноце польскаму паслу ў Маскве 17.9.1939. Для гэтага на базе Бел. і Кіеўскай ваен. акруг былі створаны франты: Бел. (4 арміі, коннамеханізаваная група і асобны стралк. корпус; камандуючы камандарм 2-га рангу М.П.Кавалёў) і Укр. (3 арміі; команд. камандарм 1-га рангу С.К.*Цімашэнка*). На Палессі па Прыпяці на З рухалася *Дняпроўская ваенная флатылія* (перасекла граніцу 18 вер.). Ім процістаялі нязначныя польскія сілы (найб. баяздольнай была аператыўная група «Палессе» пад камандаваннем ген. Ф.Клеберга з 17 тыс. чал., з іх толькі палавіна ўзброена). Часцям Чырв. Арміі загадвалася быць лаяльнымі да польскіх ваеннаслужачых, калі яны не будуць аказваць супраціўлення. СССР не абвяшчаў вайну Польшчы, урад Польшчы таксама прызнаў, што стану вайны з СССР не існуе. Вярх. галоўнакамандуючы ўзбр. сіл Польшчы маршал Э.*Рыдз-Сміглы* 17 вер. загадаў польскім войскам: «з Саветамі не ваяваць, у бой не ўступаць, за выключэннем, калі яны будуць атакаваць ці спрабаваць разброіць нашы часці...» Таму маштабных баявых дзеянняў паміж польскімі і сав. войскамі фактычна не было. Паводле польскіх крыніц, адбылося каля 40 выпадкаў супраціўлення пагран. патрулёў, а таксама баявыя сутычкі пад Кобрынам, Гроднам, Вільняй, Сапоцкінам і інш. Найб. упартыя баі разгарнуліся 20—21 вер. ў Гродне, дзе 15-ы танк. корпус толькі 20 вер. страціў 16 танкаў, 3 бронемашыны, 47 чал. было забіта і 156 паранена. У выніку паходу сав. войскі занялі тэр. Зах. Беларусі і Зах. Украіны да абумоўленай з ням. кіраўніцтвам мяжы (паводле сав.-герм. камюніке ад 22 вер. дэмаркацыйная лінія паміж сав. і герм. войскамі праходзіла па рэках Піса, Нараў, Буг, Вісла і Сан, г.зн. на З ад «*Керзана лініі*», што было аграворана ў сакрэтным пратаколе ад 23.8.1939 да *Пакта Рыбентропа—Молатава 1939*). Аднак гэта мяжа праіснавала толькі тыдзень. Паводле сакрэтнага дадатковага пратакола да дагавора аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй ад 28.9.1939 (гл. *Савецка-германскія пагадненні*), усх. частка Варшаўскага і Люблінскае ваяводства адыходзілі да Германіі ў абмен на Літву, якая з гэтага часу стала сферай уплыву СССР. Беззваротныя страты Бел. і Укр. франтоў склалі 1475 чал. З 17 па 30 вер. войскі Бел. фронту інтэрніравалі і разброілі 60 202 польскіх вайскоўцаў, сярод якіх 2066

Панарама **Чырвонага возера** (Жыткавіцкі раён).

афіцэраў. У выніку паходу зах. граніца СССР была адсунута на З на 400 км. Гл. таксама *Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР, Віленскі край, Украіна.*

Літ.: Антосяк А.В. Освобождение Западной Украины и Западной Белоруссии // Воен.-ист. журн. 1989. № 9; Марков А.Д. Военно-политические аспекты присоединения к СССР Западной Украины и Западной Белоруссии // Великая Отечественная война в оценке молодых. М., 1997; Третьяк С. Воссоединение Белоруссии // Армия. 1999. № 5; Назаўсёды разам: Да 60-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. Мн., 1999; Ладысеў У.Ф. Падзеі верасня—кастрычніка 1939 г. ў лёсе беларускага народа // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: Гісторыя і сучаснасць. Мн., 2000. Мельтюхов М.И. Советско-польские войны: Воен.-полит. противостояние, 1918—1939 гг. М., 2001. *У.Ф.Ладысеў.*

ЧЫРВОНАПУЗЫ́РНІК, род кветкавых раслін; тое, што *дрэвагубца*.

ЧЫРВОНАСЛАБО́ДСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА. Размешчана ў Клецкім, Капыльскім р-нах і на мяжы з Салігорскім р-нам Мінскай вобл., каля г.п. Чырвоная Слабада, за 34 км на З ад г. Салігорск. Пл. 23,6 км^2, даўж. 6,6 км, найб. шыр. 5,8 км, найб. глыб. 5,5 м. Аб'ём вады 69,5 млн. м^3. Катлавіна — забалочаная пойма р. Морач. 77% даўж. берагавой лініі штучныя агараджальныя дамбы; на астатнім працягу берагі нізкія. Дно выслана торфам, пяском. Сярэдні шматгадовы сцёк 78,7 млн. м^3. Рэгуляванне сцёку сезоннае, шматгадовае. Ч.в. слабапраточнае, сярэднегадавая амплітуда вагання ўзроўню вады 1 м. Замярзае ў пач. снеж., лёд (таўшчыня да 70 см) трымаецца да пач. красавіка. Слаба зарастае (маннік вадзяны, рагоз шыракалісты, рдзесты). Колер вады чырвона-буры ў выніку пашырэння тарфянікаў на вадазборы і ў донных грунтах. Водзяцца шчупак, акунь, плотка, сом, уюн, краснапёрка, карась. Выкарыстоўваецца для рэгулявання сцёку ракі і воднага рэжыму прылеглых зямель, водазабеспячэння сажалак рэсп. вытв.-гандл. унітарнага прадпрыемства «Рыбгас «Чырвоная Слабада».

А.А.Макарэвіч.

ЧЫРВОНАСЛАБО́ДСКІ БОЙ 1942, бой партызанскага атрада В.А.Васільева па разгроме ням.-фаш. гарнізона ў г.п. *Чырвоная Слабада* 31 кастрычніка ў Вял. Айч. вайну. Гарнізон (больш за 130 чал.) быў добра ўзброены. 30 кастр. атрад выйшаў з Арлікоўскага лесу і ноччу заняў зыходныя пазіцыі. З узводы партызан перакрылі дарогі на г.п. Старобін, г. Слуцк і в. Семежава, перарэзалі тэлеф. сувязь. У 4 гадз раніцы штурмавыя групы партызан атакавалі будынкі з асн. сіламі праціўніка і пасля амаль 5-гадзіннага бою вызвалілі з турмы зняволеных, спалілі будынкі жандармерыі, паліцэйскай аховы, раённай управы і інш. дамы фаш. адміністрацыі, склады з правіянтам, млын, лесапільню, электрастанцыю; захапілі шмат боепрыпасаў, грузавую машыну, матацыкл, 4 радыёпрыёмнікі, 2 пішучыя машынкі, вял. колькасць прадуктаў і дакументаў. У выніку акупацыйныя службы пакінулі Чырвоную Слабаду і не аднавілі ў ёй гарнізон.

М.Ф.Шумейка.

ЧЫРВОНАСЛАБО́ДСКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1924—59. Утвораны 17.7.1924 у *Слуцкай акрузе.* Цэнтр — г.п. *Чырвоная Слабада.* 20.8.1924 падзелены на 12 сельсаветаў. З 9.6.1927 у Бабруйскай, з 21.6.1935 у Слуцкай акр., з 20.2.1938 у Мінскай, з 20.9.1944 у Бабруйскай, з 8.1.1954 у Мінскай абл. 8.8.1959 раён скасаваны, яго тэр. перададзена ў Старобінскі, Капыльскі і Слуцкі р-ны.

ЧЫРВО́НАЯ А́РМІЯ, Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія (РСЧА), афіцыйная назва *Савецкай Арміі* ў 1918—46. З'яўлялася асн. часткай узбр. сіл сав. дзяржавы, у склад якіх таксама ўваходзілі ВМФ, пагран. і ўнутр. войскі (гл. *Узброеныя Сілы СССР*).

Чырвонаслабодскае вадасховішча.

ЧЫРВО́НАЯ БЕЛАРУ́СКАЯ ПАРО́ДНАЯ ГРУ́ПА буйной рагатай жывёлы, пародная група малочнага кірунку. Паходзіць ад стараж. чырв. усходнеслав. жывёлы. На Беларусі гадуюць на ўласных падвор'ях.

Чырвоная беларуская пародная група буйной рагатай жывёлы.

Жывёлы моцнай канстытуцыі. Масць ад светла-рыжай да цёмна-чырвонай. Маса быкоў 750—900, кароў 400—500 кг. Забойны выхад больш за 50%. Сярэдні надой малака 3500—4500 кг, тлустасць 4%. Непатрабавальныя да ўмоў утрымання, устойлівыя да хвароб.

ЧЫРВО́НАЯ БУ́ДА, вёска ў Крычаўскім р-не Магілёўскай вобл., на аўтадарозе Крычаў—Рослаўль (Расія). Цэнтр сельсавета. За 10 км на У ад г. Крычаў, 110 км ад Магілёва, 3 км ад чыг. ст. Крычаў-2. 797 ж., 325 двароў. Спіртзавод. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Брацкія магілы сав. воінаў. Помнікі падпольшчыкам і землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЧЫРВО́НАЯ ГВА́РДЫЯ, у Расіі 1917—18 узбр. фарміраванні рабочых, якія разам з часцямі арміі і флоту былі гал. ударнай сілай *бальшавікоў* у *Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917.* Узніклі пад рознымі назвамі (нар. дружыны, вольныя атрады, нар. апалчэнне і інш.) у першыя дні Лют. рэвалюцыі 1917 па ініцыятыве бальшавікоў Петраграда, Масквы, Адэсы, Харкава і інш. гарадоў. Назва «Ч.г.» пашырылася з крас. 1917. Першаснай арганізац. адзінкай Ч.г. быў дзесятак (13—15 чал.), 4 дзесяткі складалі ўзвод, 4 узводы — дружыну, 3 дружыны — батальён (каля 600 чал.), некалькі батальёнаў — полк. Складалася з добраахвотнікаў (членаў сацыяліст. партый і прафсаюзаў або рэкамендаваных імі), фарміравалася паводле тэр.-вытв. прынцыпу; камандзіры выбіраліся на сходах чырвонагвардзейцаў. Узбраенне было разнастайным: ад самаробных пік і паляўнічых стрэльбаў да кулямётаў, гармат і бронемашын. Ч.г. падпарадкоўвалася мясц. Саветам. Яе агульны колькасны склад у кастр.—ліст. 1917 дасягаў 200 тыс. чал., пасля

Кастр. рэвалюцыі — 253 тыс. У губернях і гарадах выдаваліся ўласныя статуты Ч.г., паводле якіх яна стваралася ў мэтах абароны заваёў рэвалюцыі, барацьбы з контррэвалюцыяй, аховы грамадскага парадку, умацавання сав. улады. У канцы 1917 — пач. 1918 атрады Ч.г. падаўлялі антысав. выступленні на Доне, Паўд. Урале, Украіне, Сібіры і на Д. Усходзе, з лют. 1918 удзельнічалі ў баях з наступаючымі герм. войскамі. З утварэннем Чырв. Арміі, якая спачатку фарміравалася найперш за кошт уступлення ў яе чырвонагвардзейцаў (пасобку і цэлымі падраздзяленнямі). Ч.г. (36 000 чал. на 20.5.1918) паступова расфарміравана да восені 1918, але яе асобныя атрады, пераважна з міліцэйскімі функцыямі, дзейнічалі і пазней.

Першымі фарміраваннямі, створанымі ў сак. 1917 на Беларусі на ўзор Ч.г., былі баявая дружына рабочых Оршы і рабочая міліцыя Мінска (нач. М.В.*Фрунзе*). Бел. атрады Ч.г. колькасна выраслі і ўмацаваліся ў час барацьбы з *Карнілава мяцяжом 1917*, калі яны затрымлівалі і разбройвалі эшалоны карнілаўцаў, што ішлі на Маскву і Петраград. Да кастр. 1917 у 44 нас. пунктах Беларусі налічвалася больш за 16 тыс. чырвонагвардзейцаў. Яны актыўна ўдзельнічалі ў Кастр. рэвалюцыі, у т.л. дружына пад камандаваннем П.Ф.Голуба — ва ўзбр. паўстанні ў Петраградзе. Мінскія зводныя рэв. атрады разам са зводным атрадам з Петраграда і Ч.г. Віцебска, Гомеля, Оршы, Полацка і інш. ліквідавалі супраціўленне *Стаўкі вярхоўнага галоўнакамандуючага* ў Магілёве. У пач. 1918 Ч.г. на Беларусі налічвала больш за 20 тыс. чал. Яе атрады ў лют. 1918 змагаліся з *Доўбар-Мусніцкага мяцяжом 1918*, у лют.—сак. вялі баі супраць наступаючых герм. войск каля Мінска, Калінкавіч, Жлобіна, Рэчыцы, Оршы, Гомеля, Добруша. Пазней яны былі перафарміраваны ў часці Чырв. Арміі, якія дзейнічалі на Зах. фронце.

Літ.: 80 лет Вооруженным силам Республики Беларусь // Армия. 1998. № 1.

М.Г.Нікіцін.

«ЧЫРВО́НАЯ ДАПАМО́ГА» («Czerwona Pomoc»), нелегальная газета, орган ЦК *Міжнароднай арганізацыі дапамогі рэвалюцыянерам Заходняй Беларусі* (МОПР), выданне ЦК КПЗБ. Выходзіла ў 1925—37 у Вільні на бел. і польскай мовах. Друкавала рашэнні цэнтр. органаў МОПРа і матэрыялы пра дзейнасць яго мясц. арг-цый. Пісала пра барацьбу працоўных за свае правы і свабоды, пра факты тэрору польскіх улад у адносінах да зах.-бел. насельніцтва і цяжкі стан зняволеных у турмах Польшчы, пра змаганне паліт. вязняў супраць увядзення новага турэмнага статута, пра выступленні працоўных у падтрымку зняволеных рэвалюцыянераў. Выступала ў абарону Бел. сял.-работніцкай грамады, пасольскага клуба «Змаганне». Паведамляла пра становішча працоўных у інш. краінах, у т.л. пра Лейпцыгскі працэс 1933. Шэраг артыкулаў прысвяціла антыфаш. і антываен. руху ў Зах. Беларусі.

Т.А.Лугачова.

ЧЫРВО́НАЯ ДАПАМО́ГА ЗАХО́ДНЯЙ БЕЛАРУ́СІ, гл. *Міжнародная арганізацыя дапамогі рэвалюцыянерам Заходняй Беларусі.*

«ЧЫРВО́НАЯ ЗМЕ́НА», маладзёжная газета, орган Бел. рэсп. саюза моладзі. Выдаецца з 21.4.1921 у Мінску на бел. мове, да 6.4.2002 выходзіла 4—5 разоў на тыдзень, з 23.4.2002 выходзіць як дадатак да газеты *«Звязда»* раз у тыдзень.

У 1921—24 і 1925 [па № 18 (166)] выдавалася на рус. мове пад назвай «Красная смена», у 1925—26 на бел. і рус. мовах. У Вял. Айч. вайну з 1943 да ліп. 1944 выходзіла як орган ЦК і Мінскага падп. абкома ЛКСМБ.

Асвятляе пытанні дзярж. маладзёжнай палітыкі. Публікуе аналіт. матэрыялы па праблемах адукацыі, маралі і права, экалогіі, гісторыі Беларусі, рэпартажы пра найб. значныя падзеі і дасягненні моладзі ў культ. і спарт. жыцці краіны, інтэрв'ю з дзярж. і культ. дзеячамі. Асн. тэматычныя рубрыкі і раздзелы: «Новыя павевы», «Соцыум», «Прафесіяналы», «Свая справа», «Студгарадок», «Пакаленне NEXT» і інш. Пры газеце працавала літ. аб'яднанне «Крыніцы» (да 2002), у 2001 створаны Клуб юнага журналіста.

Т.У.Люковіч.

ЧЫРВО́НАЯ ЗО́РКА, вёска ў Клецкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і племзавода. За 7 км на ПдУ ад горада і 9 км ад чыг. ст. Клецк, 134 км ад Мінска. 619 ж., 268 двароў (2003). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік архітэктуры — сядзіба (2-я пал. 18 ст.).

«ЧЫРВО́НАЯ КАПЭ́ЛА», нелегальная антыфаш. сетка ў Германіі і шэрагу акупіраваных ёю зах.-еўрап. краін у гады 2-й сусв. вайны, якая ўключала рэзідэнтуры НКУС СССР, Разведкіраўніцтва Чырв. Арміі і ням. падпольныя групы (у т.л. *Шульцэ-Бойзена — Харнака арганізацыю*). Назву «Ч.к.» ёй дало *гестапа* (на яго жаргоне радыст — «піяніст», а некалькі іх — «капэла»), якое разграміла яе ў канцы 1941— 1943.

Літ.: Пещерский В.Л. «Красная капелла»: Сов. разведка против абвера и гестапо. М., 2000.

ЧЫРВО́НАЯ КНІ́ГА, назва спісаў рэдкіх і знікаючых відаў раслін і жывёл. Змяшчае кароткія дакумент. звесткі пра біял. іх асаблівасці, пашырэнне, прычыны скарачэння колькасці, меры аховы і інш.

Збор звестак пра рэдкія і знікаючыя віды пачаты ў 1949 *Міжнародным саюзам аховы прыроды і прыродных рэсурсаў*, у 1966 выдадзены тамы «Чырвонай кнігі фактаў» («Red Data Book»), колькасць відаў у якой штогод мяняецца. Для дыферэнцыраванага падыходу ў планаванні ахоўных мерапрыемстваў распрацавана спец. шкала, паводле якой усе віды падзяляюць на 5 катэгорый у залежнасці ад стану папуляцыі. Занясенне ў Міжнар. Ч.к. пэўнага віду азначае сусв. прызнанне неабходнасці паўсядзённага клопату аб яго захаванні, таму кожная краіна, на тэр. якой трапляецца такі від, нясе маральную адказнасць за яго захаванне. У многіх краінах прыняты нарматыўныя акты па ахове асобных відаў, выдаюцца афіц. спісы ахоўных відаў, зборнікі кароткай навук. дакументацыі пра іх умоўна наз. нац. Ч.к. (Аўстралія, ЗША, Швецыя, Японія, Расія, Беларусь; гл. *Чырвоная кніга Беларусі*), Чырвонымі спісамі (Германія), спісамі рэдкіх і знікаючых раслін (ЗША, Аўстралія, Калумбія, Мексіка).

ЧЫРВО́НАЯ КНІ́ГА БЕЛАРУ́СІ, афіцыйны дакумент, які змяшчае сістэматызаваныя звесткі пра пэўныя віды жывёл і раслін на тэр. Беларусі, што з'яўляюцца рэдкімі або знаходзяцца пад пагрозай знікнення. Засн. ў 1979. Выдае кнігу Мін-ва прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. У першае выданне (1981) было ўключана 80 відаў *ахоўных жывёл* і 85 — *ахоўных раслін*. У 2-е выданне (1993) уключаны 182 віды жывёл, у т.л. млекакормячых 14 відаў, птушак 75, паўзуноў 2, земнаводных 1, рыб 5, насякомых 79, ракападобных 5, двухстворкавых малюскаў 1 від; раслін 180, грыбоў 17, лішайнікаў 17 відаў. Для кожнага віду прыведзены бел., рус. і лац. назвы, статус аховы, пашырэнне, месцы пражывання (росту), колькасць (трапляльнасць) у прыродзе, звесткі пра размнажэнне і феналогію, прычыны змены колькасці, магчымасць развядзення (вырошчвання) у няволі (у культуры), прынятыя і неабходныя меры аховы, крыніцы інфармацыі. Рыхтуецца 3-е выданне Ч.к.Б. ў 2 тамах, у якое плануецца ўключыць каля 330 відаў раслін і 200 — жывёл.

Літ.: Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь. 2 выд. Мн., 1993.

ЧЫРВО́НАЯ ЛІ́НІЯ ў горадабудаўніцтве, умоўная мяжа, якая аддзяляе магістралі, вуліцы, праезды і плошчы ад тэрыторый, прызначаных пад забудову. Будуюць як па Ч.л., так і з водступам ад яе. Забяспечвае горадабудаўнічую дысцыпліну пры буд-ве і рэканструкцыі гарадоў.

ЧЫРВО́НАЯ МЕ́ДНАЯ РУДА́, другая назва мінералу *купрыт*.

ЧЫРВО́НАЯ ПЯЧО́РА, буйная сістэма карставых вапняковых пячор у Горным Крыме (Украіна). Размешчана на зах. схіле Даўгарукаўскага масіву Гал. грады Крымскіх гор, за 23 км на ПдУ ад г. Сімферопаль. Агульная даўж. 13,1 км. Мае 6 паверхаў: у ніжнім — падземная р. Чырвонапячорная (адзін з вытокаў р. Салгір) і ўтвораныя ёю праточныя азёры. Шматлікія рознакаляровыя нацечна-кропельныя вапняковыя ўтварэнні.

ЧЫРВО́НАЯ РАКА́, адна з назваў р. *Хангха* ў Кітаі і В'етнаме.

ЧЫРВО́НАЯ РУСЬ, гістарычная назва *Галіцыі* ў некат. пісьмовых крыніцах

(пераважна зах. паходжання) 16—19 ст. Упершыню тэрмін «Ч.Р.» ужыў італьян. картограф 15 ст. Фра Маўра для абазначэння зямель у бас. р. Дон. Аднак паступова гэты тэрмін замацаваўся ў гіст. і геагр. л-ры для абазначэння тэр. б. Галіцкага княства (паводле адм. падзелу 15—18 ст. Рускае і Белзскае ваяводствы Польскага каралеўства). Назва не была пашыранай, ужывалася толькі ў л-ры.

ЧЫРВО́НАЯ РЭ́ЧКА, другая назва р. *Цна* ў Лагойскім, Барысаўскім і Смалявіцкім р-нах Мінскай вобл.

ЧЫРВО́НАЯ СЛАБАДА́, Красная Слабада, гарадскі пасёлак у Салігорскім р-не Мінскай вобл., на р. Вызенка; аўтадарогамі злучаны з Лунінцом, Слуцкам, Салігорскам. За 30 км на ПнЗ ад горада і чыг. ст. Салігорск, 163 км ад Мінска. 4985 ж. (2002). Прадпрыемствы харч., дрэваапр., лесанарыхтоўчай прам-сці. 2 сярэднія і санаторная школы, Дом культуры, б-ка, 2 бальніцы, аптэка, аддз. сувязі. Брацкія магілы сав. воінаў і партызан, ахвяр фашызму.

У ВКЛ вядома з 16 ст. як вёска, потым мястэчка Вызна ў Слуцкім княстве; уласнасць Алелькавічаў, з 1612 Радзівілаў, з 1793 Вітгенштэйнаў, потым Гогенлоэ. З 1793 у Рас. імперыі. З 1870 цэнтр воласці Слуцкага пав. У 1877 згарэла Свята-Мікалаеўская царква (у 1897 адбудавана, у 1937 зруйнавана). У 1897 у мястэчку 1593 ж., пач. школа, нар. вучылішча, бальніца, царква, капліца, 2 малітоўныя яўр. дамы. 3.1.1923 перайменавана ў мяст. Чырвоная Слабада. З 17.7.1924 да 8.8.1959 цэнтр *Чырвонаслабодскага раёна*. З 27.9.1938 гар. пасёлак. У Вял. Айч. вайну з 27.6.1941 да 30.6.1944 акупіравана ням. фашыстамі, якія восенню 1941 знішчылі тут 420 ж. У ноч на 31.10.1942 партызаны разграмілі ў Ч.С. ням. гарнізон (гл. *Чырвонаслабодскі бой 1942*). З 8.9.1959 у Старобінскім, з 25.12.1962 Любанскім, з 6.1.1965 Салігорскім р-нах.

ЧЫРВО́НАЯ СЛАБАДА́, вёска ў Акцябрскім р-не Гомельскай вобл., на р. Арэса. Да 1929 наз. Германава Слабада. Цэнтр сельсавета і камунальнага с.-г. унітарнага прадпрыемства. За 30 км на ПдЗ ад г.п. Акцябрскі, 230 км ад Гомеля, 23 км ад чыг. ст. Рабкор. 632 ж., 280 двароў (2003). Сярэдняя школа, Дом нар. творчасці, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЧЫРВО́НАЯ СЛАБАДА́, вёска ў Быхаўскім р-не Магілёўскай вобл. Да 1946 наз. Узніцкая Слабада. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 25 км на ПдУ ад горада і чыг. ст. Быхаў, 60 км ад Магілёва. 412 ж., 173 двары (2003). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЧЫРВО́НАЯ ШВА́БАЎКА, Швабы, вёска ў Лагойскім р-не Мінскай вобл., на аўтадарозе Лагойск—Бягомль. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 25 км на ПнУ ад г. Лагойск, 65 км ад Мінска, 35 км ад чыг. ст. Барысаў. 368 ж., 158 двароў (2003). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Свята-Троіцкая царква. Брацкая магіла сав. воінаў, помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЧЫРВО́НЕЦ, назва залатой манеты стандарту *дуката*; грашова-лікавая адзінка абмежаванага ўжытку; вагавая адзінка для золата. Назва ад рус. вызначэння «червонный золотой» у адносінах да замежных залатых манет 15 — пач. 18 ст.; пісьмова зафіксавана ў 1749 указам Манетнай канцылярыі Рас. імперыі, калі ў 1701—97 выпускаліся залатыя манеты без пазначэння наміналу (лігатурная маса 3,47 г, проба 986—960), у 1701—51 — двайны Ч. У 1768—1806 і 1818—67 залатая манета—рэлікт нідэрл. дуката, што незаконна білася да 1849 у Рас. імперыі для замежных плацяжоў і выплат жалавання ў пагранічных гарнізонах; вызначэнне «червонный» проціпастаўлялася Ч. і ўжывалася ў дачыненні да *імперыялаў*. У 1834—41 афіц. назва рас. манет двайнога наміналу 3 руб., або 20 злотых, у 1868—85 — наміналу 3 руб., якія паводле метралагічных даных прыблізна адпавядалі дукату. У 1922 Ч. — залатая манета РСФСР са стандартам утрымання золата, адпаведным дарэв. 10-рублёвай манеце. Яна эмітавалася і ў 1923 Дзяржбанкам СССР, але ва ўнутр. абарачэнне не паступіла, а для замежных плацяжоў не ўжывалася з-за адмовы прымаць яе замежнымі краінамі. У 1925 выпушчана пробная залатая манета СССР паводле стандарту Ч. РСФСР. У 1923—24 адзін з наміналаў і адзінка зборных адносна Ч. наміналаў банкаўскіх білетаў Дзяржбанка РСФСР узору 1922 (1, 3, 5, 10, 25 Ч.), якія былі законным плацежным сродкам ва ўсіх сав. рэспубліках. Папулярная іх назва «белыя Ч.» з-за адносна невысокага афармлення тыпу англ. фунтаў стэрлінгаў. Па ўтрыманні золата адпавядалі манеце Рас. імперыі ў 10 руб. У 1923 Ч. забяспечвалася 80% грашовага абарачэння краіны, пасля рэформы 1924 банкноты складалі 67%. З 1923 Ч. стаў адзіным цвёрдым плацежным сродкам, але фактычная адмова ад практычнай яго канверсоўнасці выклікала выбух інфляцыі Ч. Афіцыйна зняты з абарачэння ў 1947, фізічна — з пач. 1930-х г. Узор білетаў 1937 кампазіцыйна нагадваў долар ЗША 1933. Забарона вывазу па-за межы СССР банкаўскіх білетаў у 1926 выклікала адмену каціровак Ч. на замежных біржах, што прычыніла моцную шкоду замежным фін. структурам—трымальнікам Ч. і канчаткова вызначыла курс на фін. самаізаляцыю сав. краіны. Афіцыйна ўсе ўзоры Ч. СССР, знятыя ў 1947, паступова выключаліся з абарачэння з увядзеннем новых узораў адпаведных наміналаў. У Вял. Айч. вайну адзін з наміналаў і адзінка зборных адносна Ч. наміналаў акупац. грошай рэйхскамісарыята Украіна, да якога была далучана і паўд. ч. Беларусі (старыя сав. грашовыя знакі з курсам 1 Ч. = 1 акупац. марцы). Залатая манета з наміналам Ч. і гербам РСФСР узору 1922 з датамі 1974—82 выпускалася ў парушэнне прававых норм СССР для замежных калекцыянераў сав.-герм. прадпрыемствам «Міжнумізматыка». У пасляваен. час «Ч.» — простанародная назва банкаўскага білета чырв. колеру ўзору 1961 наміналам 10 руб., з пач. 1990-х г. — папулярная на тэр. Беларусі назва банкноты ЗША у 10 долараў. *І.І.Сінчук.*

ЧЫРВО́НЫ БАСЕ́ЙН, другая назва *Сычуаньскай катлавіны*.

ЧЫРВО́НЫ БЕ́РАГ, вёска ў Жлобінскім р-не Гомельскай вобл., на р. Дабасна; чыг. ст. на лініі Бабруйск—Жлобін. Цэнтр сельсавета і камунальнага с.-г. унітарнага прадпрыемства. За 26 км на ПнЗ ад г. Жлобін, 119 км ад Гомеля. 2445 ж., 797 двароў (2003). *Чырвонабярэжскі крухмала-патачны завод*, лясніцтва. *Чырвонабярэжскі аграрны каледж*. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, 2 аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — *Чырвонабярэжская сядзіба*.

Паводле пісьмовых крыніц вядома з 16 ст. як сяло ў Рэчыцкім пав. Мінскага ваяв. ВКЛ. З 1793 у Рас. імперыі. У пач. 19 ст. ва ўладанні М.С.Гатоўскага, потым Козел-Паклеўскага. У 1845 у Сцяпоўскай вол. Бабруйскага пав. Мінскай губ., 18 ж., вадзяны млын. У 1870 — 200 ж., у 1897 — 362 ж., хлебазапасны магазін, заезны дом. З пабудовай чыгункі Бабруйск—Гомель у 1873 каля вёскі адкрыта чыг. станцыя. У 1890—93 пабудавана Чырвонабярэжская сядзіба. З 1914 дзейнічала паштова-тэлегр. аддзяленне. У 1920 засн. с.-г. вучылішча, у 1922 на яго базе с.-г. тэхнікум. У 1931 створаны крухмала-патачны завод. З 14.8.1937 цэнтр Чырвонабярэжскага с/с Жлобінскага р-на, з 20.2.1938 у Гомельскай вобл. У Вял. Айч. вайну ў 1943 партызаны разграмілі ў Ч.Б. фаш. гарнізон. У 1962 да вёскі далучаны пасёлак вучэбнай гаспадаркі «Чырвоны Бераг», у 1974 — вёска Прыстань (з далучанымі да яе ў 1966 пасёлкамі крухмальна-патачнага з-да і чыг. станцыі Чырвоны Бераг). *С.В.Марцалеў* (гісторыя).

ЧЫРВО́НЫ БОР, ландшафтны заказнік рэсп. значэння ў Расонскім і Верхнядзвінскім р-нах Віцебскай вобл. Засн. ў 1997 для аховы унікальных прыродных ландшафтаў і экасістэм. Пл. 34 231 га. Ландшафт мае рысы апошняга Паазерскага зледзянення. Рэльеф моцна расчлянёны, шмат азёр, забалочаных нізін і западзін, вярховых балот, марэнных узгоркаў і град. У расліннасці дамінуюць хвойнікі імшыстыя і верасова-бруснічныя, ельнікі і вытворныя бярэзнікі, асіннікі кісліцавыя; бязлесныя, вярховыя сфагнавыя балоты і інш. У Чырв. кнізе 13 відаў раслін, у т.л. палушнік азёрны, лабелія Дортмана, нітэлопсіс прытуплены, бяроза карлікавая, шпажнік чарапіцавы, лінея паўночная, марошка прысадзістая і інш. Найб. поўны комплекс дэндрафільных і водна-

балотных відаў жывёл. У Чырв. кнізе — мядзведзь буры, рысь, беркут, арлан-белахвост, скапа, белая курапатка, чорны бусел, даўгахвостая няясыць, касманогі сыч, сярэдні кулон, залацісты сявец, чорнаваллёвая гагара, вялікі крахаль і інш. *П.І.Лабанок.*

ЧЫРВО́НЫ ГРУД, вёска ў Вярэйкаўскім с/с Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл., каля р. Ваўпянка. Цэнтр с.-г. камунальнага унітарнага прадпрыемства «Чырвоны Груд». За 22 км на ПнЗ ад Ваўкавыска, 65 км ад Гродна, 22 км ад чыг. ст. Ваўкавыск. 229 ж., 71 двор (2003). Пач. школа-сад, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў, помнік землякам, што загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЧЫРВО́НЫ ІНТЭРНАЦЫЯНА́Л ПРАФСАЮ́ЗАЎ, Прафінтэрн, міжнароднае аб'яднанне левых прафсаюзаў у 1921—37. Утвораны на 1-м Устаноўчым кангрэсе ў ліп. 1921 у Маскве; дэлегаты ад 42 краін прадстаўлялі левыя прафес. і вытв. саюзы, выключаныя з *Амстэрдамскага інтэрнацыянала прафсаюзаў*. Прафінтэрн змагаўся за адзінства сусв. прафруху ў нац. і міжнар. маштабах на аснове абароны інтарэсаў рабочага класа і згуртавання антыфаш. сіл. Усе кангрэсы прафінтэрна адбыліся ў Маскве: 2-і (1922), 3-і (1924), 4-ы (1928), 5-ы (1930, прадстаўнікі ад 51 краіны). У 1935—37 у Францыі, Іспаніі, Індыі, Канадзе і інш. краінах адбылося аб'яднанне прафсаюзаў. Да канца 1937 частка фракцый Ч.і.п. перастала існаваць, і ён спыніў сваю дзейнасць.

Літ.: Адибеков Г.М. Красный Интернационал профсоюзов. М., 1971.

ЧЫРВО́НЫ КАРА́Л, кішачнаполасцевая жывёла атр. гарганарыяў; гл. *Высакародны карал.*

ЧЫРВО́НЫ КАСТРЫ́ЧНІК, вёска ў Пухавіцкім р-не Мінскай вобл., на р. Балачанка. Да 1922 наз. Забалеўскі Двор. Цэнтр сельсавета і т-ва дадатковай адказнасці «Ізабалёва». За 25 км на У ад г. Мар'іна Горка, 80 км ад Мінска, 25 км ад чыг. ст. Пухавічы. 327 ж., 116 двароў (2003). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.

«ЧЫРВО́НЫ КРЫЖ» (у Азербайджане, Таджыкістане, Туркменістане, Узбекістане, Афганістане, Пакістане, Турцыі і араб. краінах — «Чырв. Паўмесяц», у шахскім Іране — Т-ва «Чырв. Льва і Сонца»), добраахвотныя т-вы дапамогі ваеннапалонным, хворым і параненым воінам, інш. ахвярам вайны; у мірны час аказваюць дапамогу пацярпелым ад стыхійных бедстваў, у шэрагу краін праводзяць мерапрыемствы па прадухіленні захворванняў. У міжнар. маштабе нац. т-вы «Ч.К.» (фарміраваліся з 1864, тады ж зацверджаны назва і эмблема «Ч.К.») утвараюць Міжнародны Ч.К. (МЧК), аб'яднаны Міжнар. к-там «Ч.К.» (МКЧК, створаны ў 1863 у Швейцарыі, складаецца з яе грамадзян) і Лігай т-ваў «Ч.К.», створанай у 1919 для каардынацыі дзейнасці нац. т-ваў «Ч.К.» ў мірны час (МКЧК дзейнічае ў час вайны). Асн. прынцыпы дзейнасці «Ч.К.» сфармуляваны ў міжнар. Жэнеўскай канвенцыі 1864 (дапоўнена ў 1906 і 1929), *Жэнеўскіх канвенцыях 1949*. Вярх. орган МЧК — канферэнцыя (1 раз у 4 гады), паміж канферэнцыямі — Пастаянная камісія ў Жэневе.

На Беларусі «Ч.к.» (расійскі) дзейнічаў з 1866—67: у 1877 мелася 5 губ. праўленняў, 30 крапасных і пав. к-таў «Ч.К.»; напярэдадні Кастр. рэвалюцыі 1917 дзейнічала 118 мед. устаноў «Ч.К.». 6.6.1921 СНК БССР стварыў Т-ва «Ч.К.» Беларусі (гл. *«Чырвонага Крыжа»* Беларускае таварыства), якое ў 1925—91 уваходзіла ў Саюз т-ваў «Ч.К.» і «Чырв. Паўмесяца» СССР. З 1991 самаст. т-ва, з 1994 наз. Бел. т-ва «Ч.К.». Яго вышэйшы орган — з'езд (1 раз у 5 гадоў), паміж з'ездамі кіруе Рэсп. к-т. бел. «Ч.К.» (у пач. 2000-х г. меў у падпарадкаванні 6 абл., 129 гар. і раённых арг-цый, Дарожны к-т). Ажыццяўляе аздараўленчыя, прафілактычныя, сан.-засцерагальныя мерапрыемствы, догляд хворых у хатніх умовах, падрыхтоўку сан. актыву, прапаганду донарства, сан. асвету і інш.

«ЧЫРВО́НЫ КРЫЖ» рэвалюцыйны, Палітычны «Чырвоны Крыж», назва шэрагу арг-цый, пераважна нелегальных, для дапамогі паліт. зняволеным і ссыльным, у іх ліку **«Ч.К.» *«Народнай волі»*** (1881, арганізатар Ю.М.Багдановіч, аддзелы ў Маскве, Томску, Ніжнім Ноўгарадзе і інш.); «Замежны «Ч.К.» (1882—84, Парыж, кіраўнікі — П.Л.*Лаўроў*, В.І.*Засуліч*); «Т-вы дапамогі паліт. ссыльным і зняволеным» (сярэдзіна 1880-х г. — 1917; розныя назвы і розны склад). 2) Паліт. «Ч.К.» РСФСР і СССР, існаваў у 1920—30-я г.

ЧЫРВО́НЫ ПЛО́СКІ ЛІША́Й, хранічнае захворванне, якое характарызуецца высыпкай запаленчых плоскіх вузельчыкаў чырв. колеру з васковым бляскам на скуры, слізістых абалонках шчок і языка.

Высыпае на месцах згібаў перадплеччаў і праменезапясцевых суставаў, на паверхні галёнак, найчасцей бывае са свербам. У залежнасці ад клінічных праяў адрозніваюць разнавіднасці Ч.п.л.: кольцападобную форму, пузырыстую, спічастую і інш. Цягнецца з перыядамі паляпшэння і абвастрэння. Лячэнне тэрапеўт., мясцова — процізапаленчыя і процісвербныя мазі.

«ЧЫРВО́НЫ СЦЯГ», нелегальная газета; орган ЦК КПЗБ. Выдавалася ў 1920—36 напачатку ў Вільні, потым у Мінску. Са жн. 1920 выходзіла легальна на рус. мове пад назвай «Красное знамя» як орган Віленскага к-та КП Літвы і Беларусі, з № 24 (1921) нелегальна — орган Віленскага акр. к-та КП Літвы, з канца 1922 — орган Літ.-Бел. абл. к-та КПРП, з ліст. 1924 — орган ЦК КПЗБ на бел. мове. Перыядычнасць 6—9 разоў на год. Крытыкавала падатковую палітыку польскага ўрада. Заклікала працоўных да барацьбы за іх штодзённыя патрэбы, даказвала, што толькі шляхам рэвалюцыі і ўсталявання ўлады рабочых і сялян можна палепшыць сваё становішча. Прыхільна ставілася да ідэі стварэння адзінага антыфаш. нар. фронту. Выступала ў абарону палітзняволеных. Змагалася за школу на бел. мове. Друкавала матэрыялы, прысвечаныя рэв. датам. Выйшла больш за 120 нумароў. *П.І.Зялінскі.*

«ЧЫРВО́НЫХ ВОЙСК» ПАЎСТА́ННЕ 1351—68, «Чырвоных павязак» паўстанне 1351—68, паўстанне ў Кітаі, якое скінула панаванне манг. дынастыі *Юань*. Уяўляла сабой некалькі паўстанняў, аб'яднаных агульнай назвай «Ч.в.» п. (па адзнацы паўстанцаў — чырв. хустцы).

У Паўн. Кітаі пачалося ў 1351 пад кіраўніцтвам тайнай будысцкай арг-цыі Байляньцзяо (Секта белага лотасу) і ахапіла тэр. да Карэі. Асн. ўдзельнікамі былі сяляне, і паўстанне тут набыло антыфеад. характар. У 1351 пад кіраўніцтвам Байляньцзяо пачалося сял. паўстанне ў Цэнтр. Кітаі (у сярэднім цячэнні р. Янцзы). У 1352 новае паўстанне (удзельнічалі і кіт. феадалы) ахапіла ніжняе цячэнне Янцзы. У 1353—56 сярод інш. кіраўнікоў паўстанцкіх атрадаў вылучыўся *Чжу Юаньчжан*, які з 1356 узначаліў увесь рух. У 1367—68 ён разбіў гал. сілы манголаў і ўзяў іх сталіцу Даду (Пекін); апошні манг. імператар Тагон-Тэмур уцёк у стэпы. Дынастыя Юань была скінута, Чжу Юаньчжан у 1368 абвясціў сябе першым імператарам новай кіт. дынастыі *Мін*, пры якой зноў пачаўся працэс феадалізацыі.

Літ.: Боровкова Л.А. Восстание «Красных войск» в Китае. М., 1971.

Ю.В.Бажэнаў.

«ЧЫРВО́НЫЯ», дэмакратычная плынь у нац.-вызв. руху Польшчы, Літвы, Беларусі і Украіны напярэдадні і ў час *паўстання 1863—64*. У адрозненне ад *«белых»* імкнуліся вызваліцца ад царскага ярма шляхам узбр. паўстання; нац. вызваленне звязвалі з дэмакр. пераўтварэннямі. Асн. кантынгент «Ч.» — афіцэры, студэнты, дробныя чыноўнікі, рамеснікі, дробнамаянтковая і безмаянтковая шляхта. У ідэалаг. адносінах «Ч.» былі неаднародныя і падзяляліся на 2 крылы. Левае крыло — рэвалюцыянеры-дэмакраты, якія выступалі супраць памешчыцкага землеўладання, за правы народаў на самавызначэнне, за рэв. саюз народаў у барацьбе з самадзяржаўем. Паслядоўныя рэвалюцыянеры ў Польшчы Я.*Дамброўскі*, З.*Падлеўскі*, І.Хмяленскі, Б.*Шварцэ*; на Беларусі — К.*Каліноўскі*, А.*Трусаў*, В.*Урублеўскі*; у Літве А.*Мацкявічус*, З.*Серакоўскі*. Правае крыло (лідэры А.Авейдэ, А.Гілер) — шляхецкія рэвалюцыянеры, якія выступалі з палавінчатай сац. і нац. праграмай: адстойвалі кампенсацыю памешчыкам

за зямлю ў выпадку перадачы яе сялянам, вагаліся паміж прызнаннем права Беларусі, Літвы і Украіны на самаст. развіццё і патрабаваннем аднаўлення Польшчы ў межах 1772. Асобнае месца сярод іх займалі паслядоўнікі ген. Л.Мераслаўскага, якія прыкрывалі рэв. фразай шавінізм і нацыяналізм і адмоўна ставіліся да рэв. саюзу з рус. народам. Арганізац. цэнтры «Ч.»: у Польшчы — з кастр. 1861 Гарадскі к-т (К-т руху) у Варшаве, пазней *Цэнтральны нацыянальны камітэт* у Варшаве; на Беларусі і ў Літве — з восені 1861 — *Камітэт руху* ў Вільні, пазней *Літоўскі правінцыяльны камітэт*. *Г.В.Кісялёў.*

ЧЫРВО́НЫЯ БРЫГА́ДЫ» (італьян. Brigate Rosse), левазэкстрэмісцкая (ультралевая) тэрарыст. арг-цыя ў Італіі. Засн. ў 1969—70; арганізатары і ідэйныя кіраўнікі — Курча і Франчэскіні. Асн. раён дзейнасці — прамысл. зона Мілан—Турын—Генуя. З 1974—75 складаліся з тэрарыст. сеткі (калоны; падзяляліся на брыгады да 5 чал. у кожнай — усяго да 500 баевікоў), разведкі, службы інфармацыі, псіхал. службы. У 2-й пал. 1970-х г. перайшлі да ўзбр. гвалтоўных дзеянняў (пік прыпаў на 1977—81). Намагаліся праз выкраданні, замахі і забойствы прадстаўнікоў дзярж. улады, журналістаў і інш. змяніць грамадскі лад краіны. У 1971—80 забілі 15 італьян. пракуроraў і суддзяў, у 1978 паліт. дзеяча А.*Мора*. З 1980 большасць тэрарыстаў арыштавана (1000 чал. да 1983), іх акцыі сталі менш масавымі. У 1984 раскаліліся на «старых» і «маладых». Да 1985 на волі актыўна дзейнічалі каля 100 тэрарыстаў з наяўных 300. Пасля 1989 іх дзейнасць стала малазначнай.

Літ.: Зафесов Г.Р. Тень над Апеннинами. М., 1982; Яго ж. Тайные рычаги власти. 2 изд. М., 1990. *У.Я.Калаткоў.*

ЧЫРВО́НЫЯ ВО́ДАРАСЦІ, багранкі, барвовыя водарасці (Rhodophyta), аддзел водарасцей. 2 кл.: бангіевыя і флярыдыевыя водарасці; больш за 600 родаў, каля 3800 відаў. Вядомы з археазою. Пашыраны пераважна ў морах, на вял. глыбіні пераважаюць над інш. групамі водарасцей; каля 5% відаў — у прэсных вадаёмах і на глебе. На Беларусі трапляюцца віды з родаў *батрахаспермум* і парфірыдыум.

Прымацаваныя або планктонныя мікра- і макраскапічныя арганізмы. Найб. прымітыўныя — аднаклетачныя або каланіяльныя, больш высокаарганізаваныя маюць слаявіну складанай марфал. і анат. будовы, памерам 0,5—1 м. Клеткі шмат'ядзерныя, з 1 зоркападобным або некалькімі рознай формы хларапластамі і складаным наборам пігментаў: хларафілы *a* і *d*, α- і β-караціны, фікабіліны (чырв. — фікаэрытрын, сіні — фікацыянін), якія вызначаюць афарбоўку Ч.в. — ад яркачырв. да блакітнавата-зялёнай і жоўтай. Запасное рэчыва — т.зв. багранкавы крухмал. Размнажэнне вегетатыўнае (дзяленнем клетак, ч. слаявіны або дадатковымі парасткамі), бясполае (мона-, бі-, тэтра- або паліспорамі) і палавое (*аагамія*). Характэрная асаблівасць — у цыкле развіцця няма рухомых жгуцікавых стадый. З марскіх відаў Ч.в. атрымліваюць агар-агар, ёд, арган. рэчывы, выкарыстоўваюць як кармавыя і харч. прадукты; прэснаводныя Ч.в. — індыкатары чысціні вады.

Літ.: Жизнь растений. Т. 3. М., 1977; Михеева Т.М. Альгофлора Беларуси: Таксоном. кат. Мн., 1999. *Т.М.Міхеева.*

ЧЫРВО́НЫЯ КРЫВЯНЫ́Я ЦЕ́ЛЬЦЫ, тое, што *эрытрацыты*.

«ЧЫРВО́НЫЯ КХМЕ́РЫ», неафіцыйная назва членаў Камуніст. партыі Камбоджы, якая стаяла на мааісцкіх пазіцыях. Напачатку ўваходзіла ў Нац. адзіны фронт Камбоджы (НАФК), створаны ў 1970 *Нарадомам Сіянукам* у Кітаі. Пасля таго як атрады НАФК занялі сталіцу г. Пномпень (1975), уладу ў краіне захапілі «Ч.к.», а іх лідэр *Пол Пот* стаў прэм'ер-міністрам. У 1976 Нарадома Сіянука прымусілі пайсці ў адстаўку. У 1976 краіна стала наз. Дэмакр. рэспубліка Кампучыя. У час праўлення «Ч.к.» быў устаноўлены жорсткі рэжым тэрору і генацыду (за няпоўныя 4 гады ад голаду і рэпрэсій загінула каля 3 млн. чал.). У снеж. 1978 праціўнікі Пол Пота, якія аддзяліліся ад «Ч.к.», стварылі Аб'яднаны фронт выратавання Кампучыі (АФВК), падтрыманы В'етнамам. Са студз. 1979 «Ч.к.» адхілены ад улады, але працягвалі партыз. барацьбу супраць новага ўрада і в'етн. войск. Пасля перамогі Нарадома Сіянука на выбарах 1993 («Ч.к.» байкатавалі выбары) і смерці Пол Пота (1998) урадавыя войскі *Хун Сена* выцеснілі рэшткі партызан у горныя раёны і рассеялі іх. Гл. таксама раздз. Гісторыя ў арт. *Камбоджа*. *В.У.Адзярыха.*

ЧЫ́РКА, Мольчанскі канал, рака ў Светлагорскім р-не Гомельскай вобл., левы прыток р. Жардзянка (бас. р. Дняпро). Даўж. 18 км. Пл. вадазбору 100 км^2. Пачынаецца за 3,5 км на ПнУ ад в. Вялікі Бор, вусце за 2 км на У ад в. Чыркавічы. Рэчышча каналізаванае.

ЧЫ́РКАВІЧЫ, Чырковічы, вёска ў Светлагорскім р-не Гомельскай вобл., на р. Чырка, каля р. Бярэзіна. Цэнтр сельсавета і камунальнага с.-г. унітарнага прадпрыемства. За 9 км на ПнЗ ад г. Светлагорск, 119 км ад Гомеля, 7 км ад чыг. ст. Светлагорск-на-Бярэзіне. 998 ж., 398 двароў (2003). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Царква. Брацкая магіла сав. воінаў. За 2 км на ПнЗ ад вёскі помнік маракам Дняпроўскай ваен. флатыліі.

У пісьмовых крыніцах згадваецца з 1560 як сяло дзярж. маёмасці ў Бабруйскім старостве ВКЛ. З 1565 у Рэчыцкім пав. Мінскага ваяводства. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у складзе Рас. імперыі. У 1886 сяло і маёнтак у Парыцкім пав. Мінскай губ., 611 ж., 92 двары, школа, 2 царквы. З 20.8.1924 цэнтр сельсавета Парыцкага р-на Бабруйскай акругі, з 20.2.1938 у Палескай вобл. У Вял. Айч. вайну фашысты часткова спалілі вёску. З 20.9.1944 у Бабруйскай, з 8.1.1954 у Гомельскай абл., з 29.7.1961 у Светлагорскім р-не.

ЧЫ́РКАВІЦКІ, Чырковіцкі, біялагічны заказнік рэсп. значэння ў Светлагорскім р-не Гомельскай вобл. Засн. ў 1979 для захавання ў прыродным стане месцаў росту журавін. Пл. 463 га. Размешчаны на нізінным балоце Непраходнае і вярховым Далёкае. Пласкахвалістая тэраса р. Мольча з дзюнамі, катлавінамі, лагчынамі. Глебы дзярнова-падзолістыя забалочаныя і тарфянабалотныя (слой торфу да 1,3 м). У расліннасці пераважаюць хвойнікі сфагнавыя, кусцікаі пушыцава-сфагнавыя, шмат журавін. *П.І.Лабанок.*

ЧЫ́РКІН Аляксандр Аляксандравіч (н. 2.1.1943, г. Слуцк Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне біяхіміі. Д-р біял. н. (1980), праф. (1986). Скончыў Віцебскі мед. ін-т (1965). З 1965 у Віцебскім мед. ун-це (заг. аддзела, з 1982 заг. кафедры). Навук. працы па біяхім. асновах біял. ўздзеяння ультраакустычнай энергіі і выкарыстанні біякіравальнага ультрагуку, ролі парушэнняў функцыі печані ў развіцці атэрасклерозу і інш. Дзярж. прэмія Беларусі 1986.

Тв.: Ультразвуковая терапия. Мн., 1983 (разам з У.С.Улашчыкам); Диагностический справочник терапевта. Мн., 1992 (разам з А.М.Окаракавым, І.І.Ганчарыкам); Практикум по биохимии. Мн., 2002.

ЧЫРКО́Ў Барыс Пятровіч (13.8.1901, с. Лазавая-Паўлаўка Днепрапятроўскай вобл., Украіна — 28.5.1982), расійскі акцёр, педагог. Нар. арт. СССР (1950). Герой Сац. Працы (1975). Скончыў Ленінградскі ін-т сцэн. мастацтва (1926). З 1925 акцёр ленінградскіх т-ра юнага гледача, з 1931 Новага т-ра юнага гледача. З 1945 у маскоўскіх т-ры-студыі кінаакцёра (і маст. кіраўнік), драм. т-рах імя А.Пушкіна, з 1966 імя М.Гогаля. Выкладаў ва Усесаюзным ін-це кінематаграфіі (праф.). Яго выканальніцтва вылучалася прастатой, характар-

Б.**Чыркоў** у ролі Самазванца.

насцю, гумарам. Сярод роляў: Тыль Уленшпігель («Тыль Уленшпігель» паводле Ш. дэ Кастэра), Сямён («Плады асветы» Л.Талстога), Самазванец («Барыс Гадуноў» Пушкіна), Кузаўкін («Нахлебнік» І.Тургенева), Лебедзеў («Іванаў» А.Чэхава), Распуцін («Змова імператрыцы» А.Талстога і П.Шчогалева), Мурамскі («Справа» А.Сухаво-Кабыліна) і інш. З 1928 здымаўся ў кіно: трылогія «Юнацтва Максіма», «Вяртанне Максіма», «Выбаргская старана» (1935—39); «Глінка» (1947), «Суд гонару» (1949), «Данецкія шахцёры» (1952), «Верныя сябры» (1954), «Жывыя і мёртвыя» (1964), «Мяцежная застава» (1967), «Гараджане» (1976) і інш. Аўтар успамінаў. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1947, 1949, 1952. Дзярж. прэмія Расіі 1979. Творчасці Ч. прысвечаны фільм «Наш сябар Максім» (1972).

Тв.: Опыт и раздумья: Об искусстве актера. М., 1964; Рассказы о творческом пути. М., 1965; Про нас, про актеров. 2 изд. М., 1970; ...Азорские острова. 2 изд. М., 1982.

Літ.: Жеженко М. Борис Чирков // Актеры советского кино. Л., 1974. Вып. 10.

Л.В.Календа.

ЧЫРКУ́Н Алег Міхайлавіч (н. 10.2.1942, Мінск), бел. кампазітар. Скончыў Бел. кансерваторыю (1978, кл. П.*Падкавырава*, Дз.*Смольскага*). З 1978 выкладчык Мінскага культ.-асв. вучылішча, у 1993—2002 Бел. ун-та культуры. Для яго музыкі характэрна арган. спалучэнне сучасных і фальклр. рытмаў і інтанацый: нар. муз. камедыя «Калі заспявае певень» (паст. 1991), дзіцячыя оперы «Бег бай» (паст. 1987) і «Хфірменная казка» (паст. 1989); паэма (1977) і паэма-пастараль (1981) для сімф. арк., кантаты (1980, 1984), канцэрціна (1980) для інстр. ансамбля; камерна-інстр. творы, хар. трыпціхі, вак. цыклы, песні, у т.л. для дзяцей, музыка для драм. т-ра і тэлеспектакляў і інш. *Т.Б.Варфаламеева.*

ЧЫРЧЫ́К, горад у Ташкенцкім вілаеце Узбекістана, у даліне р. Чырчык. Узнік у 1935. 158 тыс. ж. (1991). Чыг. станцыя. Прам-сць: машынабудаванне і металаапрацоўка (с.-г. машыны, трансфарматары, абсталяванне для хім. прам-сці), хім. (мінер. ўгнаенні, азотная к-та, каталізатары), каляровая металургія, лёгкая (абутковая, швейная), харч.; вытв-сць буд. матэрыялаў. Каскад ГЭС. Краязнаўчы музей.

ЧЫ́РЫКАЎ Аляксей Ілыч (1703 — ліст. 1748), расійскі мараплавец. Капітан-камандор (1746). Скончыў Марскую акадэмію ў С.-Пецярбургу (1721). У 1722—24 выкладчык, з 1746 дырэктар гэтай акадэміі. У 1725—30 і ў 1733—43 памочнік В.*Берынга* ў 1-й і 2-й Камчацкіх экспедыцыях. У 1741 на судне «Св. Павел» здзейсніў плаванне да паўн.-зах. ўзбярэжжа Паўн. Амерыкі, адкрыў шэраг астравоў з групы Алеуцкіх. У 1742 плаваў на пошукі судна «Св. Пётр», якім камандаваў Берынг, удакладніў месцазнаходжанне в-ва Ату. Удзельнічаў у складанні карты рас. адкрыццяў у Ціхім ак., дзе абагульнены вынікі дзейнасці экспедыцый (1746). Імем Ч. названы востраў і падводная гара ў зал. Аляска, мысы на а-вах Кюсю, Ату і інш.

Літ.: Дивин В.А. Русские мореплаватели на Тихом океане в XVIII в. М., 1971.

ЧЫ́РЫКАЎ Яўген Мікалаевіч (5.8.1864, г. Казань, Расія — 18.1.1932), рускі пісьменнік. Вучыўся ў Казанскім ун-це (у 1887 выключаны за ўдзел у рэв. хваляваннях). Уваходзіў у групу пісьменнікаў, якія аб'ядноўваліся вакол кнігавыдавецкага т-ва «Знание» (Пецярбург). У 1895—1902 жыў і працаваў у Мінску; адзін з заснавальнікаў *Мінскага таварыства аматараў прыгожых мастацтваў*. З 1920 у эміграцыі. Друкаваўся з 1885. Аповесці «Інваліды» (1897), «Чужаземцы» (1899), аўтабіягр. тэтралогія «Жыццё Тарханава» (кн. 1—4, 1911—25), зб-кі апавяд. «Кветкі ўспамінаў» (1912), «Раннія ўсходы» (1913) пра інтэлігенцыю. У п'есах «Яўрэі» (1904), «Іван Міроныч» (1905), «Мужыкі», аповесці «Мяцежнікі» (абедзве 1906) узняты вострыя сац. пытанні. Раман «Звер з бездані» (1926), зб. апавяд. «Чырвоны паяц: Аповесці жахлівых гадоў» (1928) пра грамадз. вайну. П'есы Ч. ў пач. 20 ст. ставіліся на Беларусі. Бел. ўражанні адлюстраваны ў яго творах («Яўрэі», «Правінцыяльныя малюнкі», 1899—1901).

Тв.: Повести и рассказы. М., 1961; Зверь из бездны: Роман, повести, рассказы, легенды, сказка. СПб, 2000; Зверь из бездны: Поэма страшных лет. Мн., 2000. *С.А.Кузняева.*

ЧЫ́РЫНА, вёска ў Кляноўскім с/с Дубровенскага р-на Віцебскай вобл., на левым беразе р. Расасенка. Цэнтр калгаса. За 21 км на ПдУ ад Дуброўна, 128 км ад Віцебска, 30 км ад чыг. ст. Асінаўка. 205 ж., 69 двароў (2003). Клуб. За 1,5 км на ПдЗ ад вёскі гарадзішча.

ЧЫРЭБО́Н (Tjirebon), Чэрыбон, горад у Інданезіі. 224 тыс. ж. (1980). Порт на паўн. ўзбярэжжы в-ва Ява. Трансп. вузел. Прам-сць: тытунёвая, тэкст., гарбарная, буд. матэрыялаў, абагачэнне фасфатаў.

Чыставуст каралеўскі.

ЧЫСТАВУ́СТ (Osmunda), род папарацей сям. чыставуставых. Каля 15 (паводле інш. звестак 27) відаў. Пашыраны ўсюды. На Беларусі 1 від — Ч. каралеўскі (O. regalis), занесены ў Чырв. кнігу. Трапляецца ў вільготных хвойніках і прыбярэжных чорнаалешніках.

Шматгадовыя карэнішчавыя расліны. Сцёблы моцныя, пераважна кароткія, укрытыя кронай буйнога (даўж. да 3 м) лісця — перыстага, скурыстага ці плевачнага, падзеленага на вегетатыўную і спараносную часткі. *Спарангіі* буйныя, шарападобныя, на кароткіх ножках, сабраныя ў *сорусы* без пакрывальца. Некат. віды — дэкар. расліны.

ЧЫСТАКРО́ЎНАСЦЬ ЖЫВЁЛ, устарэлае паняцце, якое ўжываецца пераважна ў конегадоўлі і сабакаводстве і азначае *чыстапароднасць жывёл*.

ЧЫСТАКРО́ЎНАЯ ВЕРХАВА́Я ПАРО́ДА коней. Выведзена ў 17—18 ст. у Вялікабрытаніі скрыжаваннем мясц. парод з усх. (варварыйскай, тур., араб., туркм.) і еўрап. (неапалітанскай і ісп.). Выкарыстоўваюць для вывядзення верхавых і запражных парод, у конным спорце.

Чыстакроўная верхавая парода.

Жывёлы буйныя, сухой канстытуцыі. Выш. ў карку 161—162 см. Масць рыжая, гнядая, цёмна-гнядая, шэрая.

ЧЫСТАПАРО́ДНАЕ РАЗВЯДЗЕ́ННЕ, чыстае развядзенне, метад развядзення с.-г. жывёл, пры якім для атрымання патомства спароўваюць жывёл адной пароды. Асн. мэта — захаванне і паляпшэнне якасці пароды, павелічэнне яе гомазіготнасці і фенатыпічнай аднароднасці. Умовы Ч.р.: няспынны адбор і падбор жывёл, наяўнасць у пародзе некалькіх несваяцкіх груп, дастатковая колькасць і шырокі арэал пароды, правільны догляд жывёл. Выкарыстоўваюць пры гадоўлі высокапрадукцыйных заводскіх парод, каб атрымаць племянную жывёлу для масавай жывёлагадоўлі.

ЧЫСТАПАРО́ДНАСЦЬ ЖЫВЁЛ, наяўнасць у жывёл тыповых для пэўнай пароды прыкмет і паходжання ад баць-

коў і продкаў толькі гэтай пароды (гл. *Чыстапародная развядзенне*). Пры паглынальным скрыжаванні чыстапароднымі лічацца помесі 4—5-га пакаленняў. Пры вывядзенні новых парод узнаўленчым скрыжаваннем умоўна чыстапароднымі лічацца помесі 4—5-га пакаленняў, якіх разводзілі «ў сабе».

ЧЫСТАПО́ЛЛЕ, вёска ў Каханавіцкім с/с Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл., на левым беразе р. Ужыца; чыг. ст. Бароўка на лініі Полацк—Даўгаўпілс. Цэнтр саўгаса. За 4 км на Пн ад Верхнядзвінска, 179 км ад Віцебска, 371 ж., 150 двароў (2003). Клуб, б-ка.

ЧЫСТАЦЕ́Л, род кветкавых раслін; тое, што *падтыннік*.

ЧЫ́СТАЯ КУЛЬТУ́РА БАКТЭ́РЫЙ, папуляцыя бактэрый, якая складаецца з асобін аднаго віду. У прыродзе не сустракаецца. Штучна атрымліваюць пасевам даследуемага матэрыялу (вада, глеба і інш.) на цвёрды *субстрат пажыўны*. Кожная калонія, што выраслa на субстраце, уяўляе сабой папуляцыю бактэрый, якая размножылася з адной клеткі. Выкарыстоўваюць пры відавой ідэнтыфікацыі, у мікрабіял. прам-сці.

ЧЫ́СТАЯ ЛІ́НІЯ, генетычна аднароднае патомства, што паходзіць ад аднаго агульнага продка. Атрымліваецца выходна ад самаапыльнай (расліна) ці самаапладняльнай (жывёла) асобіны шляхам *штучнага адбору* і далейшага самаапылення (самаапладнення). Асобіны ў Ч.л. гомазіготныя па большасці генаў, таму ўзнаўляюць у шэрагу пакаленняў адны і тыя ж спадчынна замацаваныя адзнакі. Кантроль за генет. зменлівасцю асобных адзнак лабараторных жывёл Ч.л. выкарыстоўваюць у эксперым. біялогіі і медыцыне.

ЧЫ́СТКА ПА́РТЫІ ў бальшавіко́ў, праверка членаў Рас. (з 1925 Усесаюзнай) камуніст. партыі (бальшавікоў) у 1920—30-я г. з мэтай выдалення з парт. радоў палітычна пасіўных і апазіцыйна настроеных людзей пад выглядам пакарання за парушэнне парт. статута і норм камуніст. маралі. Праводзіліся ўсеагульныя (генеральныя) і часткавыя чысткі. 1-я ген. Ч.п. адбылася ў 1921 пасля ўвядзення *новай эканамічнай палітыкі* (нэп): выключаны 24,1% складу партыі. 2-я ген. Ч.п. праведзена ў 1929—30 у сувязі са згортваннем нэпа і масавай *калектывізацыяй*: выключана 7,8% складу партыі. У час 3-й ген. чысткі (1933) выключаны 18,3% камуністаў і кандыдатаў у члены партыі. XVIII з'езд ВКП(б) у сак. 1939 пастанавіў адмовіцца ад Ч.п. як надзвычайных мерапрыемстваў і «чысціць» парт. рады ў звычайным парадку. Аб парт. «чістках» у БССР гл. ў арт. *Камуністычная партыя Беларусі*.

ЧЫ́СТЫ ДАХО́Д, *прыбытак*, які застаецца ў суб'екта гаспадарання пасля выплаты падаткаў і адлічэнняў; *валавы даход* без уліку заработнай платы. Ч.д. грамадства — кошт прыбавачнага прадукту, частка *нацыянальнага даходу*, якая складаецца з Ч.д. прадпрыемстваў і цэнтралізаванага Ч.д. дзяржавы.

ЧЫ́СТЫ ПАПА́Р, гл. ў арт. *Папар*.

ЧЫ́СТЫЯ МЕТА́ЛЫ, *металы* з невял. колькасцю дамешкаў. Металы сярэдняй чысціні (тэхнічна чыстыя) маюць 99,0—99,9% асн. хім. элемента, павышанай чысціні — 99,90—99,99, высокай чысціні (хімічна чыстыя) — 99,99—99,999, асобай чысціні — больш за 99,999%. Выкарыстоўваюцца ў авіяц. і ядз. тэхніцы, як ч. паліва, што ўтрымлівае метал, і інш.

ЧЫСЦЕ́НКА Рыгор Мікалаевіч (н. 29.11.1948, с. Рагінцы Раменскага р-на Сумскай вобл., Украіна), бел. вучоны ў галіне эпідэміялогіі і паразіталогіі. Д-р мед. н. (1996), праф. (1997). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1974), дзе і працуе (з 1985 заг. кафедры), адначасова з 1990 гал. паразітолаг Мін-ва аховы здароўя Беларусі. Навук. працы па эпідэміялогіі і прафілактыцы сальманелёзаў, удасканальванні сістэмы эпідэміял. нагляду.

Тв.: Общая эпидемиология. Мн., 1997; Основы дезинфекции и стерилизации. Мн., 1998 (разам з В.П.Філонавым, В.М.Гарбачовай); Иммунопрофилактика инфекционных болезней. Мн., 2002.

ЧЫСЦЕ́Ц, балота ў Вілейскім і Мядзельскім р-нах Мінскай вобл., у вадазборы р. Нарач. Нізіннага тыпу. Пл. 5,8 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 4,9 тыс. га. Глыб. торфу да 8,9 м, сярэдняя 2,7 м. Здабыча торфу на ўгнаенне. Асушаная адкрытай сеткай ч. балота выкарыстоўваецца пад сенажаць. На неасушаных землях пераважаюць хмызнякі з вольхі і вярбы, травяное покрыва пераважна з асок, часткова выкарыстоўваецца пад сенажаць.

ЧЫ́СЦІК, балота ў цэнтр. ч. Лагойскага р-на Мінскай вобл., у вадазборы р. Дзвінаса. Пераважна нізіннага тыпу. Пл. 4,3 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 3,6 тыс. га. Глыб. торфу да 7,2 м, сярэдняя 2,5 м. Асушаная ч. балота выкарыстоўваецца пераважна пад ворыва. Неасушаныя землі пад хмызняком.

ЧЫ́СЦІК (Stachys), род кветкавых раслін сям. яснотkавых. Больш за 200 (паводле інш. звестак да 300) відаў. Пашыраны ва ўмераных і субтрапічных паясах і ў горах тропікаў. На Беларусі 4 віды Ч.: аднагадовы (S. annua); балотны (S. palustris), нар. назвы галавенька, воўчая крапіва, воўчая мята; лясны (S. sylvatica), нар. назва глухая крапіва; прамы (S. recta). Трапляюцца ў лясах, хмызняках, забалочаных нізінах, па схілах яроў, як пустазелле ў садах і агародах. Культывуецца Ч. шарсцісты (S. lanata).

Адна- і шматгадовыя травяністыя расліны і паўкусты. Сцёблы 4-гранныя, выш. 20—120 см. Лісце супраціўнае, суцэльнае, радзей перыстарассечанае, зубчастае. Кветкі шматлікія, сабраныя кальчакамі ў верхавінкавае або пазушнае коласападобнае суквецце. Плод — арэшак. Патоўшчаныя карэнішчы некат. відаў, т.зв. японскі або кітайскі артышок, спажываюць у ежу. Лек., харч., эфіраалейныя, фарбавальныя, меданосныя і дэкар. расліны.

ЧЫ́СЦІК, біялагічны заказнік рэсп. значэння ў Віцебскім р-не. Засн. ў 1979 для захавання ў прыродным стане месцаў росту журавін. Пл. 300 га. Размешчаны на балотным масіве пераходнага тыпу Жукоўскае. Узгорыста-хвалістая азёрна-ледавіковая нізіна з камамі і забалочанымі азёрнымі катлавінамі. Глебы дзярнова-падзолістыя забалочаныя і тарфяна-балотныя, глыб. торфу да 5 м, у сярэднім 1,94 м. Хваёва-кусцікавасфагнавыя фітацэнозы з пераважаннем журавін. У Чырв. кнізе рагулькі высокія, тафільдыя чашачкавая, марошка прысадзістая, гарычка крыжападобная.

П.І.Лабанок.

1 2 3

Чысцік: 1 — балотны; 2 — аднагадовы; 3 — прамы.

ЧЫ́СЦІК Алег Уладзіміравіч (н. 20.10.1940, в. Клімаўка Гомельскага р-на), бел. вучоны ў галіне аграэкалогіі. Д-р с.-г. н. (1992). Скончыў БСГА (1969). З 1970 у НДІ глебазнаўства і аграхіміі. З 1992 у Міжнар. экалагічным ун-це імя А.Дз.Сахарава (Мінск, у 1992—2000 заг. кафедры). Навук. працы па вывучэнні фізіка-хім. уласцівасцей эрадзіраваных глеб, захаванні і аднаўленні іх урадлівасці; па гарызант. міграцыі радыенуклідаў у аграэкасістэмах і інш.

Тв.: Химические проблемы охраны окружающей среды. Мн., 2000 (разам з С.М.Мальчанкам); Экология. 2 изд. Мн., 2001; Распределение ^{137}Cs по «гранулометрическим» фракциям почв тридцатикилометровой зоны Чернобыльской АЭС (разам з С.М.Рудой, І.І.Матвіенкам) // Изв. вузов.Ядерная энергетика. 2002. № 3.

ЧЫСЦІ́ЛІШЧА, чысцец, паводле каталіцкага веравучэння — прамежкавае месца паміж *раем* і *пеклам*. У Ч. душы грэшнікаў, якія не атрымалі прабачэння ў зямным жыцці, але не абцяжараныя смяротнымі грахамі, перад тым як трапіць у рай, гараць у ачышчальным агні. Лёс душы ў Ч. можа быць аблегчаны, а тэрмін знаходжання яе там скарочаны, калі ў памяць памерлага родныя і блізкія, пакінутыя на зямлі, будуць рабіць «добрыя справы». У каталіцкім багаслоўі гэта выпрабаванне трактуецца як сімвал пакут сумлення і раскаяння. Уяўленне пра Ч. склалася ў 1 ст. Вучэнне аб ім распрацаваў Фама Аквінскі. Догмат пра Ч. прыняты на Фларэнційскім 1439 і пацверджаны на Трыдэнцкім 1562 саборах. Правасл. і пратэстанцкая цэрквы абвяргаюць вучэнне аб Ч.

ЧЫСЦЬ, балота ў Вілейскім (5 тыс. га) і Маладзечанскім (1,5 тыс. га) р-нах Мінскай вобл., у вадазборах рэк Уша і Ілія. Нізіннага (76%), вярховага (17%) і мяшанага (7%) тыпаў. Пл. 6,5 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 4 тыс. га. Глыб. торфу да 6,3 м, сярэдняя 1,8 м. Пасля спынення здабычы торфу на паліва землі рэкультываваныя, перададзены пад с.-г. выкарыстанне (ворыва і сенажаць).

ЧЫСЦЬ, пасёлак у Маладзечанскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 19 км на ПдУ ад г. Маладзечна, 60 км ад Мінска, 3 км ад чыг. ст. Уша. 5093 ж., 1714 двароў (2003). З-ды: буд. канструкцый, буд. матэрыялаў, дахавай чарапіцы, дрэваапр., сухіх сумесей; акц. т-ва «Забудова», ПМК 213 і шэраг інш. буд. арг-цый, сумеснае прадпрыемства «Шклолюкс», швейнае прадпрыемства «Арніка», зверагаспадарка «Чысць», жыллёва-камунальная гаспадарка. Сярэдняя і муз. школы. Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, адд. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЧЫСЦЯ́К (Ficaria), род кветкавых раслін сям. казяльцовых. Каля 10 відаў. Пашыраны пераважна ў Еўразіі. На Беларусі 1 від — Ч. веснавы (F. verna). Трапляецца ў вільготных месцах на ўзлесках, берагавых схілах, лугах, у хмызняках.

Шматгадовыя травы з клубнепадобна патоўшчанымі карэнішчамі. Сцёблы звычайна пакарочаныя. Лісце суцэльнае, пераважна мясістае. Кветкі адзіночныя, жоўтыя ці залаціста-жоўтыя. Плод — шматарэшак. Лек. расліны.

Чысцяк веснавы.

ЧЫСЦЯКО́Ў Іван Міхайлавіч (27.9.1900, в. Атрубніва Кашынскага р-на Цвярской вобл., Расія — 7.3.1979), Герой Сав. Саюза (1944), ген.-палк. (1944). У Чырв. Арміі з 1918. Скончыў кулямётную школу (1920), курсы «Выстрал» (1927), Вышэйшыя акад. курсы пры ваен. акадэміі Генштаба (1949). У Вял. Айч. вайну з 1941 камандаваў брыгадай, дывізіяй, корпусам, арміяй на Зах., Паўн.-Зах., Калінінскім, Паўд.-Зах., Данскім, Варонежскім, 2-м і 1-м Прыбалт. франтах. 6-я армія на чале з Ч. вызначылася ў 1944 пры вызваленні Віцебскай вобл.: 23 чэрв. прарвала варожую абарону ў Сіроцінскім р-не, захапіла плацдарм, 24—25 чэрв. дасягнула Зах. Дзвіны, вызваліла Улу, Ушачы, адрэзала віцебскую групоўку ворага ад полацкай і 4 ліп. вызваліла Полацк. Удзельнік вайны з Японіяй 1945. Да 1968 у Сав. Арміі.

ЧЫСЦЯКО́Ў Міхайла Барысавіч (13.1.1809, Жыздрынскі р-н Калужскай вобл., Расія — 6.10.1885), рускі педагог, пісьменнік, публіцыст. Вучыўся ў Маскоўскім ун-це (1828—32); адзін з заснавальнікаў тайнага студэнцкага т-ва. Супрацоўнічаў у час. «Телескоп» і газ. «Молва». Працаваў настаўнікам славеснасці ў пав. вучылішчах Оршы і Полацка, старшым настаўнікам у 2-й Віленскай (1833—34), Магілёўскай (1834), Віцебскай (1835—37) гімназіях. Прыцягваўся да следства па справе Т.Г.*Лады-Заблоцкага* (1834). Актыўны збіральнік бел. вершаванага і муз. фальклору, карэспандэнт П.В.Кірэеўскага. Пісаў для дзяцей («Рускія гістарычныя апавяданні», 1867; «З рускага побыту», 1868, і інш.).

ЧЫСЦЯКО́Ў Павел Пятровіч (5.7.1832, с. Пруды Цвярской вобл., Расія — 11.11.1919), расійскі педагог і жывапісец. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1849—61). Пенсіянер АМ у Парыжы і Рыме (1862—70). У 1860—64 выкладаў у Рысавальнай школе Пецярбургскага т-ва заахвочвання мастацтваў, з 1872 у Пецярбургскай АМ (у 1908—10 праф.-кіраўнік майстэрні, у 1890—1912 заг. мазаічнага аддз.). Яго пед. метад, засн. на спалучэнні непасрэднага ўспрыняцця натуры з яе навук. вывучэннем, адыграў вял. ролю ў развіцці рэалізму ў рус. мастацтве 2-й пал. 19 ст. Сярод вучняў В.Васняцоў, В.Паленаў, І.Рэпін, В.Сяроў, В.Сурыкаў, М.Урубель. У гіст. і жанравых партрэтах імкнуўся да драматызацыі гіст. сюжэта і псіхал. насычанасці вобразнага ладу: «Вялікая княгіня Соф'я Вітаўтаўна зрывае пояс з Васіля Касога на вяселлі Васіля Цёмнага» (1861), «Баярын» (1876).

Тв.: Письма, записные книжки, воспоминания. М., 1953.

Літ.: Молева Н., Белютин Э. П.П.Чистяков — теоретик и педагог. М., 1953.

ЧЫТА́, горад, цэнтр Чыцінскай вобл. Расіі, пры ўпадзенні р. Чыта ў р. Інгада. 303,3 тыс. ж. (2001). Чыг. станцыя, ву-

П.Чысцякоў. Баярын. 1876.

Чыта. Царква Міхаіла Архангела («Царква дзекабрыстаў»).

зел аўтадарог. Аэрапорт. Буйны прамысл. і культ. цэнтр Усх. Сібіры. Прам-сць: машынабудаванне і металаапрацоўка (вытв-сць станкоў, аўтазборка і інш.), дрэваапр., лёгкая (тэкст., гарбарна-абутковая, футравая), харч. (мясная, малочная, мукамольная); здабыча бурага вугалю. ДРЭС. Ін-т прыродных рэсурсаў Сіб. аддз. Рас. АН. З ВНУ. Тэатры: драм., лялек. Філармонія. Музеі: краязнаўчы, маст., дзекабрыстаў. Арх. помнік — царква Міхаіла Архангела («Царква дзекабрыстаў», 1771).

Вядома з 1653 як пас. Інгадзінскае зімоўе. З 1690 слабада, у якой жылі казакі і прамыслоўцы. У 1699 пабудаваны астрог, дзе з 1827 адбывалі катаргу многія дзекабрысты. З 1821 паселішча наз. Чыцінскім, з 1851 — горад і цэнтр Забайкальскай вобл., тут размяшчалася ўпраўленне Забайкальскага казацкага войска. Эканам. значэнне яе вырасла пасля буд-ва Забайкальскай чыгункі (1900) і калі Ч. стала рэзідэнцыяй упраўлення Нерчынскай горнай акругі. У 1920—22 Ч. — сталіца *Далёкаўсходняй рэспублікі*. З 1922 — цэнтр Забайкальскай губ., з 1926 — Чыцінскай акругі Далёкаўсходняга краю, з 1937 — Чыцінскай вобл.

ЧЫТАГО́НГ, Чатагам, горад у Бангладэш, на р. Карнапхулі, за 15 км ад Бенгальскага зал. Адм. ц. акругі Чытагонг. Вядомы з 1 ст. н.э. 3 млн. ж. (1994). Трансп. вузел. Гал. марскі порт краіны. Буйны эканам. ц. краіны. Прам-сць: джутавая, баваўняная, хім., харч., цэментавая, металаапрацоўчая, дрэваапрацоўчая (у т.л. вытв-сць запалак); металургія, нафтаперапрацоўка, з-д электраабсталявання. Суднаверф. Ун-т. Мячэці: Кадамі-Мубарак (12 ст.) і Джамі мячэць (17 ст.).

ЧЫХАЧО́Ў Пётр Аляксандравіч (28.8.1808, г. Гатчына Ленінградскай вобл. — 13.10.1890), расійскі географ, геолаг і падарожнік. Ганаровы чл. Пецярб. АН (з 1876). Скончыў дыпламат. школу (1828). Працаваў у мін-ве замежных спраў і адначасова вучыўся ў Пецярбургскім ун-це. Жыў пераважна за мяжой (Францыя, Італія). У 1833—36 наведаў Турцыю, Сірыю, Палесціну, Паўн. Афрыку, Партугалію, Іспанію і інш. У 1839—41 склаў геал. карту Апенінскага п-ва. Па матэрыялах падарожжаў па Алтаі і Паўн.-Зах. Кітаі (1842) склаў у 1845 геагр. і геал. апісанне гэтых тэрыторый, адкрыў і акантурыў Кузнецкі каменнавугальны басейн. У 1847—63

П.А.**Чыхачоў**.

А.Я.**Чычыбабін**.

даследаваў М. Азію; вынікі апрацоўкі сабраных звестак ляглі ў аснову твора «Малая Азія» (т. 1—8, 1853—69). Яго імем названы хрыбет на Алтаі, заліў у Японскім м. На завешчаныя Ч. сродкі Парыжская АН устанавіла (1890) прэмію яго імя за лепшыя даследаванні, прысвечаныя Азіі.

Літ.: Цыбульский В.В. П.А.Чихачев — исследователь, путешественник. М., 1961.

ЧЫХУА́ХУА, парода *дэкаратыўна-паказёвых сабак*. Выведзена ў старажытнасці ў Мексіцы, у мясцовасці Чыўаўа (Chihuahua, адсюль назва). Гадуюць сабакаводы-аматары ва ўсім свеце.

Чыхуахуа: 1 — караткашэрсны; 2 — даўгашэрсны.

Канстытуцыя далікатная. Выш. ў карку 17—22 см. Маса 0,9—2,7 кг. Тулава падоўжанае, галава круглая з вострай мордай, вочы пукатыя. Вушы адносна вял., стаячыя або абвіслыя. Масць рыжая розных адценняў, карычневая, белая, чорная і інш. Бываюць даўгашэрсныя (шэрсць доўгая, хвалістая, на вушах махры, на шыі каўнер, на нагах пачасе) і караткашэрсныя (шэрсць кароткая, густая, бліскучая). Патрабавальныя да ўмоў кармлення і ўтрымання.

ЧЫЦІ́НСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ. Размешчана ў Забайкаллі, у Рас. Федэрацыі. Утворана 26.9.1937. Пл. 431,5 тыс. км^2. Нас. 1249,4 тыс. чал. (2001), гарадскога 62%. Цэнтр — г. *Чыта*. Найб. гарады: Краснакаменск, Борзя, Пятроўск-Забайкальскі, Балей, Шылка. У складзе Ч.в. *Агінская Бурацкая аўтаномная акруга*.

Ч.в. займае тэр. паміж Яблanавым хр. на З і р. Аргунь на У. У рэльефе пераважаюць сярэдневышынныя горы (1400—1900 м) — хрыбты Яблanавы, Чэрскага, Баршчовачны, Даурскі, Алёкмінскі Станавік і інш., падзеленыя міжгорнымі катлавінамі. На Пн горы падымаюцца да выш. 3072 м (хр. Кодар, пік БАМ), на Пд — Прыанонская раўніна. Карысныя выкапні: волава, золата, серабро, вісмут, торый, уран, малібдэн, вальфрам, медныя (*Удаканскае радовішча медзі*, 3-е ў свеце па запасах), паліметал. і жал. руды, каменны і буры вугаль, плавікавы шпат, вырабныя камяні, буд. матэрыялы, крыніцы мінер. вод. Клімат рэзка кантынентальны. Зіма працяглая і суровая, маласнежная, лета кароткае і цёплае. Сярэдняя т-ра студз. ад -26 да -33 °С, ліп. 17—21 °С. Ападкаў 240—400 мм за год. Месцамі шматгадовая мерзлата. Гал. рэкі: Шылка (з вытокамі Анон і Інгада) і Аргунь — вытокі Амура, Алёкма, Чара і Віцім (прытокі Лены), Хілок і Чыкой (прытокі Селенгі). Буйныя азёры — Барун-Тарэй і Зун-Тарэй. Глебы пераважна горна-таежныя падзолістыя, у стэпах — чарназёмы і каштанавыя, у міжгорных катлавінах — лугава-мярзлотныя і лугава-чарназёмныя. Больш за 1/2 тэр. займаюць горна-таежныя лясы (даурская лістоўніца, хвоя, кедр). На Пд — злакава-разнатраўныя стэпы. Даурскі і Сахандзінскі запаведнікі.

Гал. галіна прам-сці — горназдабыўная; здабыча золата (Тасееўскае, Балейскае, Дарасунскае радовішчы), малібдэну, літыю, берылію, танталу, ніобію (ВА «Жырэкенскі малібдэн»), волава (Шэрлавагорскі камбінат), свінцова-цынкавых руд (Нерчынскі паліметал камбінат), прыроднага урану (Прыаргунскае радовішча, адзінае ў Расіі), флюарыту (Давенда). Паліўна-энергет. комплекс прадстаўлены здабычай каменнага і бурага вугалю (13 млн. т, 2001) і вытв-сцю электраэнергіі (5,9 млрд. кВт·гадз) на ДРЭС (Харанорская, Чыцінская) і ЦЭЦ (Краснакаменская, Первамайская, Чыцінская). Развіты чорная металургія, машынабудаванне і

металаапрацоўка (кампрэсары, халадзільныя ўстаноўкі, у т.л. для марскіх суднаў, станкі, краны, буравы інструмент), лясная і дрэваапр. (піламатэрыялы, шпалы, сталярныя вырабы, мэбля), лёгкая (тэкст., швейная, абутковая, гарбарная, футравая, вытв-сць маст. вырабаў), харч. прам-сць. Гал. галіна сельскай гаспадаркі — жывёлагадоўля (72% кошту с.-г. прадукцыі). Спецыялізуецца на танкаруннай авечкагадоўлі, мяса-малочнай жывёлагадоўлі, мясной табуннай конегадоўлі. Свіна- і птушкагадоўля. На Пн аленегадоўля, у горна-таежных раёнах пушны промысел (собаль, гарнастай, андатра). Рыбалоўства. Пад с.-г. ўгоддзямі 4814 тыс. га, у т.л. ворных зямель 712 тыс. га. Пасевы збожжавых (пшаніца, авёс, ячмень, грэчка, кукуруза) і зернебабовых культур. Бульбаводства і агародніцтва. Збор лекавых траў. Даўж. чыгунак 2399 км. На Пд — *Транссібірская магістраль*, на Пн — *Байкала-Амурская магістраль*. Даўж. аўтадарог 9806 км, гал. — Улан-Удэ—Чыта—Забайкальск — граніца з Кітаем. Суднаходства па р. Шылка. Аэрапорты: Чыта, Краснакаменск, Борзя, Балей, Нерчынск. Курорты: Дарасун, Шыванда, Ургучан, Малакоўка, Алентуй, Ямараўка і інш. *В.М.Корзун.*

ЧЫЧАГО́Ў Васіль Якаўлевіч (11.3.1726—16.4.1809), расійскі мараплавец, ваен. дзеяч. Адмірал (1782). Бацька П.В.*Чычагова*. Вучыўся ў школе навігацкіх навук, потым у Англіі. На флоце з 1742. З 1764 нач. экспедыцыі па адшуканні марскога шляху з г. Архангельск праз Паўн. Ледавіты ак. да ўзбярэжжа Паўн. Амерыкі і праз Берынгаў праліў да Камчаткі. У 1765 экспедыцыя дасягнула 80°26′ паўн. ш. на ПнЗ ад Шпіцбергена, але з-за цяжкага лёду вярнулася ў Архангельск; у 1766 дайшла да 80°30′. У рус.-тур. вайну 1768—74 камандаваў (1772—74) атрадам Данской флатыліі, якая абараняла Керчанскі праліў. У рус.-швед. вайну 1788—90 камандаваў Балт. флотам, у т.л. ў бітвах каля Эланда, Рэвеля (Талін), Выборга. З 1797 у адстаўцы. Імем Ч. наз. астравы ў архіпелагу Новая Зямля, востраў у архіпелагу Аляксандра каля Паўн. Амерыкі, заліў і мыс в-ва Науку-Хіва ў Паўд. Палінезіі, мыс на в-ве Кюсю (Японія) і гара на в-ве Шпіцберген. *У.Я.Калаткоў.*

ЧЫЧАГО́Ў (Ч ы ч а г а ў) Павел Васілевіч (6.7.1767, С.-Пецярбург — 1.9.1849), расійскі адмірал (1807). Сын В.Я.*Чычагова*. У час рус.-швед. вайны 1788—90 камандзір лінкора, нач. экспедыцыі па высадцы дэсанта ў Галандыі (1799). З 1802 таварыш (нам.) міністра, са снеж. 1802 да 1811 (фактычна да 1809) міністр марскіх спраў. З крас. 1812 галоўнакамандуючы Дунайскай арміяй, гал. нач. Чарнаморскага флоту і ген.-губернатар Малдавіі і Валахіі. У вер. 1812 Дунайская армія ў раёне Луцка аб'яднана з 3-й арміяй пад камандаваннем Ч. Паводле плана М.І.*Кутузава* 3-я армія сумесна з корпусам ген. П.Х.*Вітгенштэйна* павінна была перакрыць шляхі адыходу арміі Напалеона на р. Бярэзіна. 13 ліст. каля в. Новы Свержань рас. войскі адцяснілі атрад Ф.К.Касецкага і разбілі яго ў *Койданаўскім баі 1812*. 16 ліст. армія Ч. авалодала Мінскам. Авангард Ч. атакаваў войскі ген. Я.Г.*Дамброўскага* ў Барысаве (гл. *Барысаўская бітва 1812*) і захапіў горад. Але 23 ліст. рас. войскі выбіты з Барысава корпусам ген. Н.Ш.*Удзіно*, які пачаў падрыхтоўку да пераправы цераз Бярэзіну асн. сілы франц. арміі. Уведзены ў зман дзеяннямі франц. войск і актывізацыяй польскіх войск каля Свіслачы і аўстр. пад Нясвіжам, Ч. 24—25 ліст. перамясціў большую частку сваіх войск з-пад Барысава на Пд да мяст. Забашавічы, а атрад Я.І.Чапліца — да Барысава. Гэта дазволіла французам захапіць плацдарм на правым беразе Бярэзіны, які Ч. не здолеў ліквідаваць (гл. ў арт. *Студзёнка*), што дало магчымасць большасці франц. войск пераправіцца цераз Бярэзіну і адысці да Вільні. Пралікі Ч. і Вітгенштэйна, няўзгодненасць дзеянняў асобных вайск. груповак не дазволілі завяршыць разгром франц. арміі (гл. таксама *Чашніцкія баі 1812*). Аднак грамадская думка Расіі ўсю віну за правал аперацыі ўсклала на Ч. Яго армія яшчэ некат. час праследавала праціўніка, але ў снеж. 1812 яе перадалі пад камандаванне Вітгенштэйна. У лют. 1813 Ч. звольнены ў адстаўку. Выехаў за мяжу; жыў у Італіі і Францыі. Пакінуў мемуары.

Тв.: Архив адмирала П.В.Чичагова. Вып. 1. СПб., 1885; Переправа через Березину // Рус. архив 1869. № 7/8.

Літ.: М а з и н г Г.Ю., Е р у с а л и м ч и к Л.Ф. Березина, год 1812-й. Мн., 1991; Ю л и н В.А. Адмирал П.В. Чичагов // Вопр. истории. 2003. № 2. *А.М.Лукашэвіч.*

ЧЫЧЫБА́БІН Аляксей Яўгенавіч (29.3.1871, в. Куземін Палтаўскай вобл., Украіна — 15.8.1945), расійскі хімік-арганік; адзін са стваральнікаў айч. хімічнай фармацэўтычнай прам-сці. Акад. АН СССР (1928; чл.-кар. 1926). Скончыў Маскоўскі ун-т (1892), дзе працаваў у 1901—11. З 1930 у Францыі. Навук. працы па хіміі гетэрацыклічных азотзмяшчальных злучэнняў, гал. чын. пірыдзіну. Адкрыў рэакцыю цыклакандэнсацыі альдэгідаў з аміякам (1906), якая носіць яго імя. Устанавіў будову шэрагу алкалоідаў. Аўтар падручніка «Асноўныя пачаткі арганічнай хіміі» (1925). Прэмія імя У.І.Леніна 1926.

Тв.: Исследования по вопросу о трехатомном углероде и о строении простейших окрашенных производных трифенилметана. М., 1912; Исследования из области пиридиновых оснований. Вып. 1. М., 1918.

ЧЫЧЫБА́БІН (сапр. П а л у ш ы н) Барыс Аляксеевіч (9.1.1923, г. Крамянчуг, Украіна — 15.12.1994), рускі паэт.

У 1946—51 арыштаваны за антысав. агітацыю. Друкаваўся з 1958. У кн. паэзіі «Маладосць», «Мароз і сонца» (абедзве 1963), «Звон» (1989), «Мае шасцідзесятыя» (1990), «82 санеты плюс 28 вершаў пра каханне» (1993), «Цвіценне бульбы» (1994) і інш. маральны максімалізм, пафас жыццесцвярджэння змяняюцца паглыбленнем тэмы ўнутр. свабоды асобы, асэнсаваннем ахвярнага шляху і трагічнай адзіноты паэта. Дзярж. прэмія СССР 1990. На бел. мову асобныя вершы Ч. пераклалі П.Макаль, У.Папковіч, У.Скарынкін.

Тв.: Борис Чичибабин в стихах и прозе. Харьков, 1995.

Літ.: Всему живому не чужой ...: Борис Чичибабин в статьях и воспоминаниях. Харьков, 1998.

ЧЫЧЭ́Н-ІЦА́ (Chichén-Itzá), палітычны і культ. цэнтр народа *майя* на Пн п-ва Юкатан (Мексіка). Заснавана, верагодна, у 8 ст. н.э. У 10 ст. захоплена *тальтэкамі*, з сярэдзіны 11 ст. сталіца іх дзяржавы. У 1178 заваявана войскамі 3 гарадоў-дзяржаў — Майяпана, Ушмаля і Ічмаля. У 13 ст. страціла значэнне паліт. цэнтра, у 15 ст. заняпала. У час ісп. заваёў (сярэдзіна 16 ст.) — у руінах. Археал. раскопкамі (сістэматычна з 1924) адкрыты буйныя архіт. помнікі майя-тальтэкаў: «Храм Кукулькана», «Храм воінаў», абсерваторыя «Караколь», стадыёны для гульні ў мяч і інш. У адрэстаўрыраванай частцы Ч.-І. — музей. Помнікі архітэктуры Ч.-І. ўключаны ў спіс *Сусветнай спадчыны*.

Літ.: Гуляев В.И. Города-государства майя. М.,1979.

ЧЫЧЭРО́НЕ (італьян. cicerone ад лац. Ciceronis Цыцэрон), праваднік, экскурсавод у краінах Зах. Еўропы, пераважна ў Італіі. Інфармуе турыстаў пры аглядзе выдатных мясцін горада, музеяў і інш.

ЧЫЧЭ́РЫН Барыс Мікалаевіч (7.6.1828, г. Тамбоў, Расія — 16.2.1904), расійскі юрыст, гісторык, філосаф, публіцыст, грамадскі дзеяч; адзін з заснавальнікаў *Дзяржаўнай школы* ў гіст. навуцы. Скончыў Маскоўскі ун-т (1849), прафесар у ім (1861—68). Выдаваў з К.Дз.*Кавеліным* паліт. рукапісную л-ру. З сярэдзіны 1850-х г. Ч. — адзін з лідэраў ліберальна-заходніцкага рас. грамадска-паліт. руху (гл. *Заходніцтва*). Ухваляў сял. рэформу 1861, адмоўна ставіўся да рэв. дэмакратаў, падтрымліваў палітыку ўрада ў адносінах да Польшчы і *паўстання 1863—64*. Прыхільнік канстытуцыйнай манархіі. У 1868 у адстаўцы, займаўся навук. працай, удзельнічаў у дзейнасці земства. У філас. поглядах прытрымліваўся правага *гегельянства*. Працы па гісторыі дзярж. права, паліт. вучэнняў. Аўтар «Успамінаў» (ч. 1—4, 1929—34).

ЧЫЧЭ́РЫН Георгій Васілевіч (24.9.1872, в. Караул Інжавінскага р-на Тамбоўскай вобл., Расія — 7.7.1936), расійскі паліт. і дзярж. дзеяч. Пляменнік Б.М.*Чычэрына*. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1896). З 1897 працаваў у Мін-ве замежных спраў. З 1904 удзельнічаў у с.-д. руху. У 1904—17 у эміграцыі (Германія, Францыя, Англія). У часы эміграцыі сакратар Цэнтр. бюро замежных груп рус. палітэмігрантаў. З 1905 чл. РСДРП, з 1906 прыхільнік меншавізму. У 1-ю сусв. вайну інтэрнацыяналіст. У студз. 1918 вярнуўся ў Расію. У 1918—30 нарком замежных спраў СССР (да 1922 РСФСР). У складзе сав. дэлегацыі падпісаў *Брэсцкі мір 1918*. Узначальваў сав. дэлегацыі на *Генуэзскай канферэнцыі 1922, Лазанскай канферэнцыі 1922—23*. Падпісаў *Рапальскі дагавор 1922* з Германіяй і інш. Чл. ЦК ВКП(б) у 1925—30. Аўтар прац па гісторыі рэв. руху, міжнар. адносін.

Тв.: Статьи и речи по вопросам международной политики. М., 1961.

Літ.: Зарницкий С.В., Сергеев А.Н. Чичерин. 2 изд. М., 1975.

ЧЫЯЎРЭ́ЛІ Міхаіл Эдышэравіч (6.2.1894, Тбілісі — 31.10.1974), грузінскі акцёр, кінарэжысёр, сцэнарыст. Нар. арт. СССР (1948). Скончыў Тбіліскую школу жывапісу і скульптуры. З 1921 працаваў у т-ры мастаком, рэжысёрам, акцёрам. У кіно з 1921. Зняўся ў фільмах: «Арсен Джарджыяшвілі», «Сурамская крэпасць», «Жахі мінулага», «Натэла», «Ханума». Паставіў фільмы: «Першы карнет Стрэшнеў» (з Я.Дзіганам), «У апошні час» (абодва 1928), «Хабарда» (1931), «Апошні маскарад» (1934), «Арсен» (1937), «Вялікае зарава» (1938), «Георгій Саакадзе» (1942—43), «Клятва» (1946, прэмія Міжнар. кінафестывалю ў Венецыі), «Падзенне Берліна» (1950, прэмія Міжнар. кінафестывалю ў Карлавых Варах), «Іншыя зараз часы» (1965) і інш. Пісаў сцэнарыі да сваіх фільмаў. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1943, 1946, 1947, 1950.

Літ.: Амирэджиби Н. На заре грузинского кино. Тбилиси, 1978.

ЧЫЯЎРЭ́ЛІ Сафіко (Соф'я Міхайлаўна; н. 21.5.1937, Тбілісі), грузінская актрыса. Дачка М.*Чыяўрэлі*. Нар. арт. Грузіі (1976). Нар. арт. Арменіі (1979). Скончыла Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1960). З 1960 у Т-ры імя К.Марджанішвілі (Тбілісі). Валодае майстэрствам пераўвасаблення. Сярод роляў: Джульета («Рамэо і Джульета» У.Шэкспіра), Ганна Карэніна («Ганна Карэніна» паводле Л.Талстога), Рэгіна («Прывіды» Г.Ібсена). З 1957 здымаецца ў кіно: «Наш двор», «Аповесць пра адну дзяўчыну», «Генерал і маргарыткі», «Іншыя зараз часы», «Хеўсурская балада», «Не бядуй!», «Колер граната», «Цяпло тваіх рук», «Мелодыі Верыйскага квартала», «Некалькі інтэрв'ю па асабістых пытаннях», «Легенда пра Сурамскую крэпасць», «Ашык-Керыб» і інш., тэлефільмы «Берагі», «Шукайце жанчыну» і інш. Дзярж. прэмія СССР 1980.

Літ.: Лордкипанидзе Н.Г. Софико Чиаурели. М., 1983.

ЧЭБАКСА́РСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА. На р. Волга, у Мардовіі, Чувашыі і Ніжагародскай вобл. Расіі. Утворана плацінай аднайм. ГЭС. Запоўнена ў 1980—82. Пл. 2190 км^2, аб'ём 13,85 км^3, даўж. 341 км, найб. шыр. 16 км. Сезоннае рэгуляванне сцёку; ваганні ўзроўню да 3 м. Палепшыла ўмовы суднаходства і водазабеспячэння.

ЧЭБАКСА́РЫ (чувашскае Шупашкар), горад, сталіца Чувашыі, у Рас. Федэрацыі, на правым беразе р. Волга. 461,2 тыс. ж. (2001). Рачны порт, чыг. станцыя, вузел аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: машынабудаванне і металаапрацоўка (трактары, ткацкія станкі, электрапрылады і апараты, кабель і інш.), лёгкая (тэкст., швейная, трыкат.), харч.; вытв-сць буд. матэрыялаў. ГЭС. Чувашская АН, Чувашская нац. акадэмія. З ВНУ, у іх ліку ун-т. 5 тэатраў. Філармонія. Музеі: маст., краязнаўчы (філіял — В.І*Чапаева*, які нарадзіўся ў в. Будайкі, цяпер у межах горада) літаратурны. Арх. помнікі: Увядзенскі сабор (1651), дом Зелейшчыкава (1697), Троіцкі манастыр (17 ст.), цэрквы Уваскрэсення і Міхайла-Архангельская (1702), Успення (1763).

Упершыню ўпамінаецца ў 1469. З 1555 крэпасць Маскоўскай дзяржавы, заселеная стральцамі. У канцы 17 — 18 ст. гандл. цэнтр Паволжа (соль, хлеб, футра, гарбарная сыравіна, мёд). З 1708 у складзе Казанскай губ., з 1781 павятовы горад. З 1920 цэнтр Чувашскай аўт. вобласці, з 1925 сталіца Чувашыі.

Да арт. **Чычэн-Іца**. Абсерваторыя «Караколь».

ЧЭБА́Н (Ceban) Тамара Савельеўна (22.10.1914, с. Берэзложы, Малдова — 1990), малдаўская спявачка (сапрана). Нар. арт. СССР (1960). Скончыла Кішынёўскую кансерваторыю (1946). З 1944 салістка Малд. радыё, з 1951 выступала з аркестрам малд. нар. інструментаў «Флуераш». З 1975 выкладала ў Кішынёўскім ін-це мастацтваў. У рэпертуары малд. нар. песні (больш за 400) і інш. народаў, творы малд. кампазітараў. Дзярж. прэмія СССР 1950.

ЧЭ́ДВІК (Chadwick) Джэймс (20.10.1891, г. Болінгтан, Вялікабрытанія — 24.7.1974), англійскі фізік-эксперыментатар. Чл.

Лонданскага каралеўскага т-ва (1927). Скончыў Манчэстэрскі і Кембрыджскі ун-ты. З 1923 нам. дырэктара *Кавендышскай лабараторыі*, з 1935 праф. Ліверпульскага ун-та, з 1948 дырэктар каледжа Кембрыджскага ун-та. Навук. працы па фізіцы атамнага ядра і радыеактыўнасці. Адкрыў нейтрон пры апрамяненні альфа-часціцамі берыліевай мішэні (1932). Разам з інш. выявіў ядз. фотаэфект — дысацыяцыю дэйтрона на пратон і нейтрон пад уздзеяннем гама-квантаў (1934—35), прадказаў бета-распад нейтрона. Адзін з першых вызначыў крытычную масу урану-235. У 1943—45 узначальваў групу англ. вучоных, якія ўдзельнічалі ў стварэнні амер. атамнай бомбы. Нобелеўская прэмія 1935.

Літ.: Староселъская-Никитина О.А. История радиоактивности и возникновения ядерной физики. М., 1963; Нейтрон: Предыстория, открытие, последствия. М., 1975.

ЧЭДЖУДО́, Чэчжудо, вастраў у паўн. ч. Усх.-Кітайскага м., тэр. Рэспублікі Карэя. Аддзелены ад Карэйскага п-ва і Японскіх а-воў пралівамі Чэджу і Карэйскім. Пл. 1850 км^2. Выш. да 1950 м (вулкан Халасан). Берагі пераважна абрывістыя. Складзены з вулканічных парод. У цэнтры востраў вулкан Халасан (апошняе вывяржэнне ў 10 ст.). Клімат субтрапічны мусонны. Ападкаў да 2000 мм за год. Вечназялёныя і лістападныя шыракалістыя лясы, вышэй 1600 м — пераважна хвойныя. На месцах зведзеных лясоў — лугі. Нац. парк Халасан. Пасевы рысу. Лоўля рыбы і малюскаў. Гал. горад — Чэджу.

ЧЭЙЗ (Chase) Джэймс Хэдлі [сапр. Рэймандр (Raymond) Рэнэ Брабазон; 24.12.1906, Лондан — 12.6.1985], англійскі пісьменнік. Скончыў Каралеўскую школу (г. Рочэстэр, графства Кент). Майстар дэтэктыва. Аўтар 94 раманаў: «Ніякіх архідэй для міс Блэндзіш» (1939; экранізацыя 1951, 1971), «Ты будзеш са мной для гэтага» (1946), «У лабірынце смерці» (1957), «Юныя дзяўчаты асцерагаюцца» (1959), «Пярсцёнак Борджа» (1971) і інш. Яго творы адметныя цікавай інтрыгай, дынамічным развіццём дзеяння, займальнасцю і парадаксальнасцю; у іх паказаны сістэма каштоўнасцей і склад жыцця людзей у грамадстве, дзе ўсё прадаецца і купляецца, страта чалавекам маральных арыенціраў.

Тв.: Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—32. Мн., 1991—95.

ЧЭЙЗ (Chase) Сцюарт (8.3.1888, г. Сомерсуэрт, ЗША — 16.11.1985), амерыканскі эканаміст. Вучыўся ў Масачусецкім тэхнал. ін-це (1907—08) і Гарвардскім ун-це (1910). Працаваў у Федэральнай гандл. камісіі (1917). У 1920—40-я г. кансультант шэрагу ўрадавых устаноў ЗША. У працы «Мэты для Амерыкі» (1942) паказаў неабходнасць і магчымасць павышэння эфектыўнасці вытв-сці на аснове тэорыі змешанай эканомікі, у аснове якой спалучэнне прыватнага прадпрымальніцтва і дзярж. рэгулявання эканам. працэсаў. Лічыў, што змешаная эканоміка найб. поўна рэалізуецца ва ўмовах ваен. эканомікі, у якой ён бачыў адзін са сродкаў пашырэння асабістага спажывання і ажыццяўлення шырокай праграмы грамадскіх работ, скарачэння беспрацоўя і вырашэння інш. сац. праблем. Паводле Ч., гал. ролю ў правядзенні рэформ, пераадоленні існуючых у грамадстве стэрэатыпаў і негатыўных з'яў у псіхалогіі і паводзінах людзей павінна адыграць інтэлігенцыя («Трагедыя марнатраўства», 1925; «Тэхнакратыя», 1933).

Дж. **Чэдвік**.

Э.Б.**Чэйн**.

ЧЭ́ЙМБЕРС, Чэмберс (Chambers) Уільям (хрышчаны 23.2.1726, г. Гётэбарг, Швецыя — 8.3.1796), англійскі архітэктар. Вучыўся ў Парыжы (1749—50) у Ж.Ф.Бландэля і ў Італіі (1750—55). У 1740-я г. служыў у Швед. Ост-Індскай кампаніі, наведаў Індыю і Кітай. З 1760 прыдворны архітэктар, з 1782 гал. наглядчык каралеўскіх будынкаў. Чл.-заснавальнік Лонданскай АМ (1768). Адзін са стваральнікаў тыпу рамант. пейзажнага парку. У паркавых збудаванняў (парк К'ю ў графстве Сурэй, 1757—62) выкарыстоўваў ант., гатычныя і ўсх. матывы. Сярод твораў: Шатл. банк у г. Эдынбург (1771—72), Сомерсет-хаўс у Лондане (1776—86) і інш. Іл. гл. да арт. *Лондан*.

ЧЭЙН (Chain) Эрнст Борыс (19.6.1906, Берлін — 12.8.1979), англійскі вучоны ў галіне біяхіміі. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1949). Замежны чл. Рас. АН (1976). Скончыў Берлінскі ун-т (1930). З 1935 у Оксфардскім ун-це, з 1948 дырэктар Міжнар. цэнтра хім. мікрабіялогіі (Рым). З 1961 у Лонданскім ун-це (праф. біяхіміі). Навук. працы па вывучэнні мікробных антыбактэрыяльных рэчываў, механізмах уздзеяння інсуліну. Вылучыў чысты пеніцылін і вызначыў яго хім. будову (1939). Нобелеўская прэмія 1945 (з А.*Флемінгам* і Х.У.*Флоры*).

В.Ф.Ермакоў.

ЧЭК (англ. check), грашовы дакумент установленай формы; адзін з відаў *каштоўных папер*. Друкуецца на спец. паперы са ступенямі аховы. З'яўляецца распараджэннем чэкадаўца (асобы, якая выпісала Ч.) банку або інш. крэдытнай установе аб выплаце ўказанай у Ч. сумы грашай трымальніку Ч. (асобе, якой выдадзены Ч.). Гэта сума здымаецца з чэкавага рахунку чэкадаўца ў банку і пераводзіцца або выдаецца банкам чэкатрымальніку; банк можа аплаціць Ч. і за кошт крэдыту чэкадаўца. Ч. бываюць іменныя (на пэўную асобу), ордэрныя (на карысць якой-н. асобы), прад'яўнічыя (на прад'яўніка). Ч. сапраўдны на працягу пэўнага тэрміну. Для разлікаў паміж банкамі выкарыстоўваюцца Ч. банкаўскія. Таксама Ч. наз. квітанцыю касы аб прыёме грошай ад пакупніка ў рознічным гандлі, якая сведчыць пра аплату і дае магчымасць атрымаць пакупку. Дзейнічае ў межах крамы, дзе ён аплачаны.

ЧЭК (Cech) Томас Роберт (н. 8.12.1947, г. Чыкага, ЗША), амерыканскі біяхімік і малекулярны генетык. Чл. Нац. АН ЗША (1987), Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1988). Скончыў Каліфарнійскі ун-т у г. Берклі (1975). З 1975 у Нац. анкалагічным цэнтры пры Масачусецкім тэхнал. ін-це, з 1978 ва ун-це штата Каларада ў г. Боўлдэр (з 1983 праф.). Адначасова з 1978 у Нац. ін-це здароўя, з 1988 у мед. ін-це Ховарда Х'ю (з 2002 прэзідэнт). Навук. працы па біяхіміі, малекулярнай і структурнай біялогіі, генетыцы. Адкрыў ферментатыўна актыўныя малекулы рыбанкулеінавых к-т (рыбазімы) і даказаў, што РНК з'яўляецца не толькі пераносчыкам генет. інфармацыі, але, падобна бялкам, таксама каталізуе жыццёва важныя ўнутрыклетачныя хім. рэакцыі (1982, незалежна ад С.*Олтмена*). Нобелеўская прэмія 1989 (з Олтменам). Нац. Навук. медаль ЗША (1995).

Тв.: Рус. пер. — РНК-фермент // В мире науки. 1987. № 1.

М.М.Касцюковіч.

ЧЭ́КАВАЯ КНІ́ЖКА, збращураваны блок чэкавых фармуляраў, які выдаецца ўкладчыку пры адкрыцці рахунка. Кліент атрымлівае наяўныя грошы з бягучага рахунка з дапамогай *чэкаў* і расплачваецца імі з інш. фіз. і юрыд. асобамі. Звычайна чэкі афармляюцца на спец. бланках, якія выраблюцца друкарскім спосабам на спец. паперы і забяспечваюцца паслядоўнай нумарацыяй. У адрозненне ад банкаўскіх іх называюць «чэкамі з чэкавай кніжкі».

ЧЭКАНА́ЎСКАС (Čekanauskas) Вітаўтас (н. 13.5.1930, г. Шаўляй, Літва), літоўскі архітэктар. Нар. архітэктар СССР (1975). Акад. АМ СССР (1988). Скончыў Літ. маст. ін-т (1955). Працаваў у Ін-це праектавання гар. буд-ва ў Вільнюсе. У аўтарскім калектыве выканаў праекты планіроўкі і забудовы грамадскага цэнтра на правым беразе р. Нярыс (1964), жылога раёна Лаздзінай (1967—74; Ленінская прэмія 1974), помніка А.Міцкевічу (1983). Паводле яго праектаў пабудаваны грамадскі бу-

дынак і жылы квартал Саюза літ. кампазітараў (1966), Выставачны палац (1967), Ін-т эканомікі сельскай гаспадаркі (1979), будынак ЦК КПЛ (1982, цяпер Дом урада). Работы Ч. адметныя рацыянальнай выразнасцю планаў і аб'ёмных структур, гарманічнай сувязі з прыродным ландшафтам. Дзярж. прэмія Літвы 1971. Іл. гл. да арт. *Вільнюс*.

ЧЭКЕ́ЦІ (Cecchetti) Энрыка (21.6.1850, Рым — 12.11.1928), італьянскі артыст балета, балетмайстар, педагог. Вучыўся ў Фларэнційскай акадэміі танца. З 1868 выступаў у т-рах Італіі, з 1885 вядучы танцоўшчык т-ра «Ла Скала» ў Мілане. З 1887 першы танцоўшчык, з 1890 балетмайстар, з 1892 рэпетытар Марыінскага т-ра ў Пецярбургу, адначасова выкладаў у Пецярбургскім тэатр. вучылішчы. З 1902 кіраваў школай пры Варшаўскай оперы, з 1906 заснаванай ім школай у Пецярбургу. У 1911—21 гал. педагог-рэпетытар «Рускага балета Дзягілева». Заснаваў школы ў Лондане (1918), Мілане (1925). Танцор-віртуоз. Першы выканаўца партый: Блакітная птушка («Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага), Бог ветру Ваю («Талісман» Р.Дрыга) і інш. Сярод яго вучняў: А.*Ваганава*, А.*Горскі*, Т.*Карсавіна*, М.*Кшасінская*, С.*Ліфар*, В.*Ніжынскі*, Г.*Паўлава*, М.*Фокін*. Практычны вопыт Ч. абагульнены С.Бомантам і С.Ідзікоўскім у «Падручніку тэорыі і практыкі класічнага і тэатральнага танца паводле метаду Чэкеці» (1922).

ЧЭКІДЖА́Н Аганес Аруцюнавіч (н. 23.12.1928, г. Стамбул, Турцыя), армянскі харавы дырыжор. Нар. арт. СССР (1978). Скончыў Стамбульскую кансерваторыю (1951), «Эколь нармаль» у Парыжы (1953). З 1961 у Арменіі, маст. кіраўнік і гал. дырыжор Дзярж. хар. капэлы Арменіі, адначасова з 1982 дырэктар і маст. кіраўнік Арм. т-ра оперы і балета. З 1975 выкладае ў Ерэванскай кансерваторыі (з 1982 праф.). Выступае і як сімф. дырыжор. Аўтар вак.-сімф. і інш. твораў. Дзярж. прэмія Арменіі 1970. Дзярж. прэмія СССР 1975.

ЧЭ́КМАН, Чэкмонас Валерый Мікалаевіч (н. 26.12.1936, в. Завалля Манастырышчынскага р-на Чаркаскай вобл., Украіна), бел. і літоўскі мовазнавец. Д-р філал. н. (1982). Скончыў Растоўскі ун-т (1965). З 1968 у Ін-це мовазнаўства АН Беларусі, з 1979 у Вільнюскім ун-це (з 1983 праф., у 1989—99 заг. кафедры слав. філалогіі). У 2001—03 дырэктар Цэнтра па вывучэнні культ. меншасцей Літвы. Даследуе бел. і рус. дыялекталогію, гісторыю праслав. мовы, літ.-слав. моўныя кантакты, дыялектную фанетыку літ. мовы. Аўтар кн. «Гісторыя проціпастаўленняў па цвёрдасці-мяккасці ў беларускай мове» (1970), «Гукі беларускай мовы» (1973, з А.Падлужным), «Даследаванні па гістарычнай фанетыцы праславянскай мовы: Тыпалогія і рэканструкцыя» (1979), артыкулаў.

ЧЭЛЕКЕ́Н, паўвостраў на ўсх. узбярэжжы Каспійскага м., у Туркменістане. Пл. каля 500 км^2. Выш. да 100 м. Утварыўся ў выніку прычлянення да берага в-ва Чэлекен з-за паніжэння ўзроўню Каспійскага м. (пасля 1937). Пераважаюць пяскі і саланчакі. Паверхня раўнінная. Радовішчы нафты, газу, азакерыту. Рыбалоўства. На Ч. — г. Хазар (да 2000 Чэлекен).

«ЧЭ́ЛЕНДЖЭР», пілатуемы касм. карабель ЗША, гл. ў арт. *«Спейс Шатл»*.

ЧЭЛЕНТА́НА (Celentano) Адрыяна (н. 6.1.1938, Майланд, Італія), італьянскі кінаакцёр і рэжысёр, эстрадны спявак. У кіно з 1959. Яркі камед. акцёр, яму ўласцівы гумар, эксцэнтрычнасць, вострая пластыка: «Серафіна» (1968), «Блеф» (1976), «Утаймаванне сваволькі» (1981), «Ён горшы, чым я» (1985) і інш. Як рэжысёр дэбютаваў парадыйнай камедыяй «Супераграбленне ў Мілане» (1965). У сваіх фільмах выступае адначасова як выканаўца гал. роляў, аўтар музыкі і песень (мюзіклы «Юпі-Ду», 1975; «Джаан Он», 1986). У творчасці спалучае традыцыі неарэаліст. камедыі і італьян. фальклору з сучаснымі эстр. і танц. рытмамі.

ЧЭЛЕ́СТА (італьян. celesta ад celeste нябесны), ударна-клавішны муз. інструмент. Формай корпуса, малаточкавым механізмам і клавіятурай падобны на невял. *піяніна* ці *фісгармонію*; замест струн храматычна настроеныя стальныя пласцінкі (ці трубкі). Дыяпазон c^1—c^5, натуецца на актаву ніжэй за рэальнае гучанне. Сканструявана ў 1886. Вызначаецца пяшчотным гукам, які нагадвае



Чэлеста.

гучанне званочкаў. Выкарыстоўваецца ў сімф. аркестрах.

ЧЭЛІ́НІ (Cellini) Бенвенута (3.11.1500, г. Фларэнцыя, Італія — 13.2.1571), італьянскі скульптар, ювелір, пісьменнік; прадстаўнік *маньерызму*. Вучыўся ў ювеліра М.Бандынелі, зазнаў уплыў Мікеланджэла. З 1532 працаваў у Фларэнцыі, Пізе, Балоніі, Венецыі, Рыме, з 1540 — у Парыжы і Фантэнбло пры двары Францыска I. У сваіх творах уласабляў вытанчаныя, празмерна выцягнутыя фігуры, часта ў складаных паваротах (сальніца караля Францыска I, 1539—43; «Нарцыс», 1540-я г.; «Укрыжаванне», 1562, у касцёльным комплексе Эскарыял, Іспанія), вырашаў праблемы абсалютна круглай скульптуры (статуя «Персей», 1545—54, Лоджыя дэі Ланцы, Фларэнцыя). Аўтар мемуараў «Жыццё Бенвенута, сына маэстра Джавані Чэліні фларэнцінца, напісанае ім самім у Фларэнцыі» (не завершаны, прадыктаваны ім паміж 1558 і 1565; выд. 1728), якія вылучаюцца непасрэднасцю аповеду, ігнараваннем норм літ. стылю, правіл граматыкі; у ёй мова вуліцы, ярка ўвасоблены характар чалавека позняга італьян. Адраджэння. Тэарэт. праца «Два трактаты пра ювелірнае мастацтва і скульптуру» (1568).

Б.**Чэліні**. Сальніца караля Францыска I.

Тв.: Рус. пер. — Жизнь... 2 изд. М., 1958.
Літ.: Виппер Б.Р. Бенвенуто Челлини // Виппер Б.Р. Статьи об искусстве. М., 1970.

ЧЭЛЮ́СКІН, мыс, паўн. край п-ва Таймыр і самы паўн. пункт мацерыка Еўразія (77°43′ паўн. ш. і 104°18′ усх. д.). Палярная станцыя (з 1932). Названы ў гонар С.І.*Чэлюскіна*, які першы дасягнуў мыса ў 1742.

ЧЭЛЮ́СКІН Сямён Іванавіч (каля 1700 — пасля 1760), расійскі палярны даследчык. З дваран Калужскай губ. Вучыўся ў Маскоўскай школе матэм. і навігацыйных навук (1714—26), скончыў Марскую акадэмію ў С.-Пецярбургу (1728), з 1733 у складзе аднаго з атрадаў 2-й Камчацкай экспедыцыі пад кіраўніцтвам В.В.*Прончышчава*, потым Х.П.*Лапцева*. Вясной 1741 прайшоў па сушы ад

вусця р. Хатанга да вусця р. Пясіна і апісаў ч. зах. ўзбярэжжа п-ва Таймыр, зімой 1741—42 — з Туруханска да вусця Хатангі і апісаў усх. і зах. ўзбярэжжа Таймыра да паўн. пункта мацерыка. З 1743 служыў на Балт. флоце. У гонар Ч. названы мыс і паўвостраў на Таймыры і параход «Чэлюскін».

Літ.: Троицкий В.А. Географические открытия В.В.Прончищева, Х.П.Лаптева и С.И.Челюскина на Таймыре // Летопись Севера. М., 1975. Т. 7.

ЧЭЛЮ́СКІНЦЫ, удзельнікі палярнай экспедыцыі на параходзе «Чэлюскін». Мэта экспедыцыі — прайсці *Паўночным марскім шляхам* за адну навігацыю на неледакольным судне, даставіць зімоўшчыкаў і грузы на в-аў Урангеля, сабраць навук. звесткі пра палярныя моры. «Чэлюскін» (пабудаваны ў Даніі ў 1933, водазмяшчэнне 7500 т, названы імем С.І.*Чэлюскіна*) выйшаў у рэйс 8.8.1933 з Мурманска ва Уладзівасток. У Берынгавым праліве судна было зацёрта льдамі, штормам вынесена ў Чукоцкае мора і 13.2.1934 расціснута вялізным ледзяным валам. Параход затануў за 100 км ад берага. У суровых умовах арктычнай зімы 104 удзельнікі экспедыцыі (начальнік О.Ю.*Шміт*, капітан судна У.І.Варонін) высадзіліся на дрэйфуючую льдзіну і праз 2 месяцы на самалётах былі вывезены на мыс Ванкарэм на ПнЗ Чукоцкага п-ва. У аперацыі выратавання, што працягвалася з 5 сак. па 13 крас. 1934, прымалі ўдзел лётчыкі М.В.Вадап'янаў, І.В.Даронін, М.П.Каманін, С.А.Леванеўскі, А.В.Ляпідзеўскі, В.С.Молакаў, М.Т.Сляпнёў, якія першымі ў СССР атрымалі званне Героя Сав. Саюза. Усе чэлюскінцы ўзнагароджаны ордэнам Чырв. Зоркі. *В.П.Кісель.*

ЧЭЛЯ́БІНСК, горад, цэнтр Чэлябінскай вобл., у Расіі, на р. Міяс (бас. р. Об). 1081,1 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Буйны прамысл. і культ. цэнтр Паўд. Урала. Прам-сць: чорная (чыгун, сталь, пракат, стальныя трубы) і каляровая (цынк, ферасплавы) металургія, машынабудаванне і металаапрацоўка (гусенічныя трактары, бульдозеры, грэйдэры, танкі, электрарухавікі, абсталяванне для чорнай металургіі, гадзіннікі і інш.), хім. (лакі і фарбы), лёгкая (гарбарна-абутковая, трыкат., швейная), харч. (мяса-малочная, лікёра-гарэлачная, тытунёвая і інш.), дрэваапр.; вытв-сць буд. матэрыялаў. ДРЭС. 3 ун-ты, мед. акадэмія, 3 ін-ты. Тэатры: драм., оперы і балета, лялек, юнага гледача. Філармонія. Цырк. Музеі: краязнаўчы, дэкар.-прыкладнога мастацтва, карцінная галерэя. Каля Ч. здабыча бурага вугалю.

Засн. ў 1736 як рус. казацкая крэпасць на месцы башкірскага паселішча Чэляба. З 1743 Ч. — горад, цэнтр Ісецкай правінцыі. У 1744 заняты атрадамі Е.І.*Пугачова*, якія ўтрымлівалі крэпасць 2 месяцы. З 1781 Ч. — павятовы горад Екацярынбургскай прав. Пермскага, потым Уфімскага намесніцтва, з 1796 — Арэнбургскай губ. У 1890-я г. з будаўніцтвам Вял. Сібірскай магістралі і чыгункі на Екацярынбург Ч. стаў буйным трансп. і гандл. (вываз хлеба з Зах. Сібіры) цэнтрам. 26.5.1918 захоплены чэш. войскамі (гл. *Чэхаславацкага корпуса мяцеж 1918*). У 1919—23 цэнтр Чэлябінскай губ., потым у складзе Уральскай вобл. З 1934 Ч. — абл. цэнтр. У Вял. Айч. вайну ў Ч. эвакуіравана каля 60 прамысл. прадпрыемстваў з зах. рэгіёнаў, у т.л. з Беларусі.

ЧЭЛЯ́БІНСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ. Размешчана на Паўд. Урале, у Рас. Федэрацыі. Утворана 17.1.1934. Пл. 87,9 тыс. км². Нас. 3651 тыс. чал. (2001), гарадскога 81%. Цэнтр — г. *Чэлябінск*. Найб. гарады: Магнітагорск, Златауст, Міяс, Азёрск, Троіцк, Капейск.

Паводле характару рэльефу Ч.в. падзяляюць на 2 ч.: зах. — з хрыбтамі і градамі Паўд. і Сярэдняга Урала (выш. да 1406 м, г. Нургуш) і ўсх. — раўнінную (на ПдУ Зауральскае плато, на ПнУ ч. Зах.-Сібірскай раўніны). Карысныя выкапні: буры вугаль (запасы 542,2

млн. т), жал. руда, магнезіт, графіт, вогнетрывалыя гліны, ільменітавыя, тытана-магніевыя, медныя і нікелевыя руды, баксіты, золата, тальк, фасфарыты, малахіт, каштоўныя камяні, мінер. буд. матэрыялы. Клімат рэзка кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад -16 да -18 °С, ліп. 17—19 °С. Ападкаў за год ад 270 мм на раўнінах да 600 мм у гарах. Гал. рэкі: Урал, Ай і Уфа (бас. р. Волга), Міяс і Уй (бас. р. Об). Шмат азёр (Увільды, Чэбаркуль, Тургаяк). Вадасх. Аргазінскае і Верхнеўральскае. Глебы — звычайныя і вышчалачаныя чарназёмы, шэрыя лясныя, горна-лясныя шэрыя і лугава-чарназёмныя. Пад лесам 28% тэр., пераважаюць хвойныя пароды. Цэнтр. ч. займае лесастэп, на Пд — разнатраўна-злакавы стэп. Нац. паркі Зюраткуль і Таганай, запаведнікі Ільменскі і ч. Паўд.-Уральскага.

Ч.в. — індустр.-агр. рэгіён Расіі. Доля прам-сці ў валавым рэгіянальным прадукце складае 41%. Пераважаюць галіны цяжкай прам-сці. Здабыча руд чорных і каляровых металаў. Чорная (51% прамысл. прадукцыі; чыгун, сталь, пракат, коксахімія) і каляровая (цынк, медзь, нікель) металургія, машынабудаванне і металаапрацоўка (абсталяванне для горнай і металургічнай прам-сці, грузавыя аўтамабілі і запчасткі да іх, гусенічныя трактары, бульдозеры, грэйдэры, танкі, ракетна-касм. тэхніка, стратэгічныя ракеты падводнага старту, ядзерныя боепрыпасы, станкі, электрарухавікі, акумулятары, халадзільнікі, мед. інструменты і інш.), хім. (азотныя ўгнаенні, лакі, фарбы, сінт. смолы) прам-сць. Паліўна-энергет. комплекс звязаны са здабычай бурага вугалю і выпрацоўкай электраэнергіі (17,8 млрд. кВт·гадз) на ДРЭС (Троіцкая, Паўд.-Уральская, Чэлябінская) і ЦЭЦ (Магнітагорская, Кыштымская, Чэлябінская -1, -2, -3). Развіта лясная і дрэваапр. (нарыхтоўка драўніны, вытв-сць мэблі), лёгкая (абутковая, трыкат., швейная), харч. (мяса-малочная, кандытарская, лікёра-гарэлачная, алейна-тлушчавая, макаронная і інш.) прам-сць; вытв-сць буд. матэрыялаў. Гал. галіна сельскай гаспадаркі — жывёлагадоўля (65% валавой с.-г. прадукцыі). Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней, авечак. Птушкагадоўля. Пл. с.-г. угоддзяў 4,7 млн. га, у т.л. worныя землі 3,8 млн. га. Пераважаюць збожжавыя культуры (пшаніца, ячмень, авёс, грэчка, проса); з тэхн. культур пашыраны сланечнік. Бульбаводства, агародніцтва. Пладаводства. Даўж. чыгунак 1793 км; гал. магістралі Уфа—Чэлябінск—Курган, Беларэцк—Магнітагорск—Карталы, Орск—Карталы—Троіцк—Чэлябінск. Даўж. аўтадарог з цвёрдым пакрыццём 8108 км. Развіты трубаправодны транспарт. Курорты: Кісегач, Увільды. *П.І.Рогач.*

ЧЭ́ЛЯДЗЬ, 1) у Стараж. Русі ў 11—13 ст. найб. залежная катэгорыя эксплуатуемага насельніцтва, значную частку якой складалі *халопы* (рабы). У 14—16 ст. назва поўных халопаў, у 17—19 ст. — дваровых людзей памешчыкаў. 2) У ВКЛ у 14—16 ст. найб. бяспраўная катэгорыя залежнага і эксплуатуемага сельскага насельніцтва (гл. *Чэлядзь няво́льная*). У 16—18 ст. — дваровыя слугі феадалаў. *М.Ф.Спірыдонаў.*

ЧЭ́ЛЯДЗЬ НЯВО́ЛЬНАЯ, у ВКЛ у 14—16 ст. найб. бяспраўная катэгорыя залежнага і эксплуатуемага сельскага насельніцтва, якая звычайна не мела зямлі і сродкаў вытв-сці, жыла ў дварах феадалаў, утрымлівалася імі і была іх поўнай уласнасцю. Асн. прычынамі няволі былі нараджэнне ад бацькоў — Ч.н., шлюбы вольных з нявольнымі, самапродаж у вечную няволю, некат. крымінальныя злачынствы і палон. Ч.н. выконвала гал. ч. разнастайныя с.-г. работы, часам адм.-гасп. абавязкі (*цівуны*,

рыкунні). Пад уздзеяннем сац.-эканам. фактараў у 16 ст. Ч.н. паступова трансфармавалася ў прыгонных сялян. У ходзе правядзення *валочнай памеры* ў дзярж. і прыватных маёнтках Ч.н., як правіла, была надзелена невял. зямельнымі ўчасткамі і такім чынам ператварылася ў *агароднікаў*. *М.Ф.Спірыдонаў.*

ЧЭ́МБЕРГ Валянціна Ільінічна (23.1.1917, С.-Пецярбург — 21.11.1990), бел. і расійская актрыса. Засл. арт. Беларусі (1944). Нар. арт. Расіі (1981). Скончыла Цэнтр. тэатр. вучылішча ў Ленінградзе (1939). У 1939—41 і з 1944 у Дзярж. рус. драм. т-ры Беларусі. З 1947 у ленінградскіх т-ры драмы імя А.Пушкіна, з 1950 у драм. т-ры імя В.Камісаржэўскай. Акцёрскія работы вызначаліся псіхал. дакладнасцю, маст. выразнасцю, своеасаблівасцю сцэн. трактовак. Сярод лепшых роляў на бел. сцэне: Вольга («Тры сястры» А.Чэхава), Марыя («Дванаццатая ноч» У.Шэкспіра), Олуэн («Небяспечны паварот» Дж.Б.Прыстлі), Дама з вязаннем («Крамлёўскія куранты» М.Пагодзіна). Інш. ролі: Агудалава («Беспасажніца» А.Астроўскага), Фёкла Іванаўна («Жаніцьба» М.Гогаля), Судакова («Гняздо глушца» В.Розава).

ЧЭ́МБЕРЛЕН (Chamberlain) Оўэн (н. 10.7.1920, г. Сан-Францыска, ЗША), амерыканскі фізік. Чл. Нац. АН ЗША (1960). Скончыў каледж у Дортмундзе (1941). У 1942—46 працаваў у Лос-Аламаскай лабараторыі над стварэннем атамнай бомбы. З 1948 у Каліфарнійскім ун-це ў Берклі (з 1958 праф.). Навук. працы па ядз. фізіцы, фізіцы высокіх энергій і стварэнні палярызаваных пратонных мішэняў для высокаэнергетычных ядз. рэакцый. У 1955 адкрыў антыпратон (з Э.Дж.*Сегрэ* і інш.). Нобелеўская прэмія 1959 (разам з Сегрэ).

ЧЭ́МБЕРЛЕНЫ (Chamberlain), дзяржаўныя і паліт. дзеячы Вялікабрытаніі. Джозеф (8.7.1836, Лондан — 2.7.1914). Вучыўся ў каледжы Лонданскага ун-та (1850—52). Фабрыкант. У 1873—76 мэр г. Бірмінгем. З 1876 дэп. парламента ад ліберальнай партыі. У 1880—85 і 1886 міністр ва ўрадах У.Ю.*Гладстана*. У 1886 выступіў супраць законапраекта аб наданні Ірландыі аўтаноміі і з групай прыхільнікаў (ліберал-юніяністаў) выйшаў з ліберальнай партыі, а пазней з'яднаўся з кансерватарамі. У 1895—1903 міністр калоній. Адзін з ініцыятараў *англа-бурскай вайны 1899—1902*.

Осцін (16.10.1863, г. Бірмінгем — 16.3.1937), сын Джозефа. Вучыўся ў Кембрыджскім ун-це, потым у Парыжы і Берліне. З 1892 дэп. парламента. У 1902—1905, 1915—17, 1919—22 на розных міністэрскіх пасадах, у 1924—29 міністр замежных спраў. Змагаўся за гегемонію Вялікабрытаніі ў Еўропе, у межах гэтай палітыкі падпісаў Рэйнскі гарантыйны пакт 1925 (гл. *Лакарнскія дагаворы 1925*). Ініцыятар разрыву дыпламат. адносін Вялікабрытаніі з СССР у 1927 (адноўлены ў 1929 урадам лейбарыстаў).

Невіл (18.3.1869, Эдгбэстан каля г. Бірмінгем — 9.11.1940), сын Джозефа. Вучыўся ў Бірмінгемскім каледжы. Займаўся прадпрымальніцтвам. У 1915—16 лорд-мэр Бірмінгема. З 1918 дэп. парламента ад кансерватыўнай партыі. У 1922—29 і 1931 на розных міністэрскіх пасадах, у 1931—37 міністр фінансаў. У 1930—31 старшыня кансерватыўнай партыі, у 1937—40 яе лідэр і прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі. Прыхільнік тактыкі ўступак гітлераўскай Германіі, для прадухілення новай вайны падпісаў *Мюнхенскае пагадненне 1938*. Няўдалы для Вялікабрытаніі пачатак 2-й сусв. вайны прымусіў яго ў маі 1940 пайсці ў адстаўку. *М.Г.Нікіцін.*

ЧЭ́МБЕРЛІН (Chamberlin) Эдуард Хейсцінгс (18.5.1899, Ла-Конер, штат Вашынгтон, ЗША — 1967), амерыканскі эканаміст, аўтар *манапалістычнай канкурэнцыі тэорыі*. Чл. Амер. эканам. асацыяцыі і інш. т-ваў. Вучыўся ва ун-тах штата Аява, Мічыганскім і Гарвардскім. З 1920 выкладаў у Мічыганскім, Гарвардскім, Парыжскім і Капенгагенскім ун-тах. Лічыў, што ва ўмовах рыначнага гаспадарання канкурэнцыя паміж фірмамі набывае форму канкурэнцыі прадуктаў, пры якой вял. значэнне маюць іх якасць, рэклама і цэнавая канкурэнцыя. Сцвярджаў, што кожная фірма валодае элементам манапольнай улады, бо яна выпускае свой прадукт, адрозны ад інш. Паводле Ч., ва ўмовах манапаліст. канкурэнцыі фірма працуе з залішнімі магутнасцямі (выдаткамі), таму яна заўсёды менш эфектыўная, чым аналагічнае прадпрыемства пры дасканалай (поўнай) канкурэнцыі.

Тв.: Рус. пер. — Теория монополистической конкуренции. М., 1959. *С.Ф.Дубянецкі.*

ЧЭ́МІСАЎ Барыс Паўлавіч (н. 25.9.1936, с. Арлоўка Жанасемейскага р-на Сямпалацінскай вобл., Казахстан), бел. вучоны ў галіне тэхналогіі машынабудавання. Канд. тэхн. н. (1971), праф. (1995). Скончыў Калінінградскі тэхн. ін-т рыбнай прам-сці і гаспадаркі (1965). З 1973 у Полацкім ун-це (з 1974 дэкан ф-та, з 1976 заг. кафедры). Навук. працы па тэхналогіі ўмацавання і аднаўлення дэталей і машын ферамагнітнымі парашкамі ў магн. полі.

Тв.: Технология размерно-чистовой и упрочняющей обработки. Мн., 1993 (у сааўт.); Обработка деталей машин в магнитном поле. Мн., 1995 (разам з Л.М.Кажурам); Синергетические аспекты физико-химических методов обработки. Мн., 2000 (у сааўт.).

ЧЭМПІЁН (англ. champion ад позналац. campio змагар), 1) званне, якое прысвойваецца пераможцу (спартсмену ці камандзе) у афіц. спарт. спаборніцтвах (напр., чэмпіянатах) па пэўных відах спорту, комплексных спарт. спаборніцтваў, у т.л. Алімп. гульняў, спартакіяд і інш. Абсалютны Ч. — пераможца спаборніцтваў сярод усіх удзельнікаў, незалежна ад узросту, масы цела і інш. Абс. чэмпіянаты праводзяць у боксе, барацьбе, культурызме і інш. У гімнастыцы званне абс. Ч. прысвойваецца за перамогу ў мнагабор'і. Званне алімп. Ч. захоўваецца за спартсменам навечна. 2) Жывёла (напр., сабака), якая па колькасці балаў (выстаўляюцца трыма і больш рознымі экспертамі) атрымлівае першае месца на выстаўцы ці ў спаборніцтвах. *Т.У.Люковіч.*

ЧЭМПІЯНА́Т, афіцыйныя спарт. спаборніцтвы вышэйшага ўзроўню ў якім-н. відзе спорту для пэўных калектываў, тэрыторыі (раёна, горада, вобласці, краіны, кантынента, свету); розыгрыш першынства з мэтай вызначэння пераможцы — *чэмпіёна* (спартсмена або каманды). Паводле структуры адрозніваюць Ч. камандныя, асабістыя і асабістакамандныя. У асобных выпадках паняцці «Ч.» і «першынство» адрозніваюцца (напр., Ч. па футболе, хакеі — сярод дарослых, а пяршынствы краіны — сярод юніёраў, спарт. клубаў). Адкрыты Ч. — афіц. спарт. спаборніцтвы з мэтай вызначэння чэмпіёна са свабодным допускам ці запрашэннем спартсменаў інш. прыналежнасці (інш. клуба, краіны). Тэрмін «Ч.» ужываюць таксама ў адносінах да выставак-спаборніцтваў жывёл (напр., коней, сабак і інш.) з мэтай выяўлення лепшых у якой-н. пародзе. *А.М.Петрыкаў.*

ЧЭМУЛЬПО́, назва да 1945 горада *Інчхон* у Паўд. Карэі.

ЧЭНДУ́, горад у цэнтр. ч. Кітая, у даліне р. Міньцзян. Адм. цэнтр прав. Сычуань. Засн. ў 4 ст. да н.э. 3,4 млн. ж. (2000). Буйны трансп. вузел і прамысл. цэнтр краіны. Прам-сць: шматгаліновае машынабудаванне (станкі, інструменты, радыёапаратура, трансп. сродкі), вытв-сць медзі, алюмінію, хім. угнаенняў, металаапрацоўка, дрэваапрацоўка, лёгкая, харч., тэкстыльная. Маст. рамёствы, у т.л. вытв-сць парчы. Ун-т. Арх. помнікі: комплекс храма Ухаўцы (16—18 ст.), палац Цын'янгун («Палац чорнага казла», 13 ст.) і інш.

ЧЭ́НСЛЕР, Чэнслар (Chancellor), Рычард (?—10.11.1556), англійскі мараплавец. У 1553 камандаваў адным з трох караблёў экспедыцыі, адпраўленай англ. гандл. кампаніяй на пошукі Паўн.-Усх. праходу (гл. *Паўночны марскі шлях*) пад кіраўніцтвам Х.Уілабі. Абагнуўшы з Пн Скандынаўскі і Кольскі п-авы, дасягнуў вусця Паўн. Дзвіны. Быў прыняты ў Маскве Іванам IV і ў сак. 1554 атрымаў грамату на права свабоднага гандлю з Маскоўскай дзяржавай. Справаздачу Ч. апрацаваў яго спадарожнік К.Адамс. У 1555 Ч. 2-і раз пабываў у Маскве, на зваротным шляху загінуў у час шторму.

ЧЭ́ПІК Мікалай Пятровіч (16.4.1960, в. Май Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. — 29.2.1980), Герой Сав. Саюза (1980).

М.П.Чэпік.

Працаваў манцёрам на Мінскай дыстанцыі пуці Бел. чыгункі. З 1978 у Сав. Арміі. Служыў у складзе абмежаванага кантынгента сав. войск у Афганістане. У адным з баёў 29.2.1980 нам. камандзіра сапёрнага ўзвода ст. сяржант Ч. быў паранены ў нагу і акружаны маджахедамі. Каб не трапіць у рукі праціўніка жывым, Ч. узарваў міну, ад асколкаў якой загінуў сам і знішчыў некалькі дзесяткаў ворагаў. На магіле Ч. ў в. Блужа помнік, яго імем названы прыгарадны электрапоезд.

ЧЭ́ПІК Міхаіл Піліпавіч (3.8.1925, в. Залессе Лепельскага р-на Віцебскай вобл. — 22.11.2000), бел. мастак. Скончыў Мінскае маст. вучылішча (1952). У 1951—85 мастак-дэкаратар Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Працаваў у розных жанрах станковага жывапісу: «Вечар у вёсцы» (1953), «За намі родная зямля» (1958), «Горад увечары» (1961), «Уставай, краіна вялікая» (1967), «Курган славы» (1970), «Працоўныя будні» (1973), «На Купаллі» (1975), «Час цвіцення траў» (1980), «Партызанская быль» (1985), «Вячоркі» (1989), «Бульба» (1991), «Над родным Нёманам. Я.Колас», «Сон» (абедзве 1992); у акварэлі, графіцы, плакаце. Аўтар сцэнаграфіі спектакля «Вертэр» Ж.Маснэ (1959). Творы вызначаюцца прастатой, раўнавагай і суразмернасцю кампазіцыі, яркай дэкаратыўнасцю, паэтызацыяй вобразаў. *Л.Ф.Салавей.*

ЧЭРАВАСЯЧЭ́ННЕ, хірургічная аперацыя; тое, што *лапаратамія*.

ЧЭ́РАП, шкілет галавы пазваночных жывёл і чалавека; таксама храстковая капсула, якая ахоўвае мозг у галаваногіх малюскаў. У пазваночных утвораны храстком і (або) косцю.

Ч. жывёл змяняецца ў ходзе эвалюцыі, што абумоўлена прагрэсіўным развіццём *галаўнога мозга* і органаў пачуццяў, заменай жабернага дыхання лёгачным і зменай спосабаў харчавання пры выхадзе арганізма з воднага асяроддзя на сушу. Адрозніваюць Ч. восевы і вісцэральны. Восевы або мазгавы — пярэдні працяг восевага шкілета тулава, які разрастаецца вакол галаўнога мозга, органаў нюху і ўнутр. вуха. Вісцэральны, або тваравы Ч. — шкілет пярэдняга аддзела кішэчніка (глоткі). Сярод сучасных пазваночных найб. прымітыўна пабудаваны Ч. у круглародых. У касцявых рыб мазгавы Ч. укрыты накладнымі касцямі. У птушак і млекакормячых рэзка павялічваецца аб'ём чарапной поласці. Для Ч. многіх млекакормячых характэрна ўтварэнне комплексных касцей (напр., скроневай).

Чэрап чалавека. Косці: 1 — насавая; 2 — слёзная; 3 — рашэцістая; 4 — лобная; 5 — цемянная; 6 — скроневая; 7 — клінападобная; 8 — скулавая; 9 — ніжнясківічная; 10 — верхнясківічная.

Ч. чалавека складаецца з 23 касцей: 8 парных — цемянныя, скроневыя, верхнясківічныя, ніжнія насавыя ракавіны, паднябенныя, скулавыя, слёзныя, насавыя; 7 няпарных — лобная, патылічная, клінападобная, рашэцістая, сашнік, ніжнясківічная, пад'язычная. Дзве апошнія косці сучленены з Ч. рухома, астатнія нерухома, праз швы. У дзяцей да года ў месцы злучэння касцей Ч. ёсць перапончаты прамежак — цемечка. Праз шматлікія каналы і адтуліны асновы (ніжняй часткі) Ч. праходзяць *чэрапнамазгавыя нервы* і крывяносныя сасуды, а праз вял. патылічную адтуліну поласць Ч. злучаецца са спіннамазгавым каналам. Тваравы Ч. (складаецца з 14 дробных касцей) утварае касцявы шкілет верхніх аддзелаў органаў дыхання (нос) і стрававання (рот, глотка), у ім размешчаны органы слыху, зроку, нюхальная ч. носа. Паводле асаблівасцей будовы Ч. чалавека вызначаюць *антрапалагічныя тыпы*.

Літ.: Сперанский В.С., Зайченко А.И. Форма и конструкция черепа. М., 1980; Ромер А.Ш., Парсонс Т.С. Анатомия позвоночных: Пер. с англ. Т. 1. М., 1992. *А.С.Леанцюк.*

ЧЭРАПНАМАЗГАВЫ́Я НЕ́РВЫ, чарапныя нервы, парныя *нервы*, якія адыходзяць ад пярэдняй паверхні ствала *галаўнога мозга* паслядоўна спераду назад праз асобыя адтуліны *чэрапа*. Інервуюць пераважна органы і тканкі галавы і шыі, а таксама грудной і брушной поласцей. У міксін — 7 пар Ч.н., у міног, рыб і земнаводных — 10, у паўзуноў — 11, у птушак, млекакормячых і чалавека — 12.

I і II пары — нюхальны і зрокавы нервы — праводзячыя шляхі нюхальнай і зрокавай сістэм; III, IV і VI пары — вокарухальны, блокавы і адводны нервы — у млекакормячых інервуюць мышцы вока, раснічнага цела і радужнай абалонкі, у паўзуноў і птушак — мышцы мігальнай перапонкі; V пара — трайчасты нерв — інервуе скуру галавы (акрамя патылічнай вобласці), цвёрдую мазгавую абалонку, зубы, слізістую абалонку рота, жавальныя мышцы, вял. слінныя залозы; VII пара — нерв твару — у наземных пазваночных інервуе паверхневую мускулатуру шыі, мышцу, якая апускае ніжнюю сківіцу, у прыматаў — мімічную мускулатуру; VIII пара — слыхавы нерв — звязвае органы слыху, раўнавагі і гравітацыі з галаўным мозгам; IX пара — языкаглоткавы нерв — інервуе ў наземных пазваночных глотку, калявушную залозу, смакавыя почкі языка; X пара — блукальны нерв — падзяляецца на рад галін, якія інервуюць мышцы жаберных дуг, плавальны пузыр, органы бакавой лініі, лёгкія, сэрца, кішэчнік; XI пара — дадатковы нерв — інервуе мышцы плечавога пояса; XII пара — падязычны нерв — інервуе мышцы языка і пад'язычны апарат. У адрозненне ад *спіннамазгавых нерваў*, Ч.н. не сегментаваныя і строга спецыялізаваныя.

А.С.Леанцюк.

М.Чэпік. На Купаллі. 1975.

ЧЭРАПУ́НДЖЫ, населены пункт на ПнУ Індыі, у штаце Мегхалая, на плато Шылонг (на выш. 1300 м). Лічыцца са-

мым дажджлівым месцам на Зямлі; сярэднегадавая колькасць ападкаў каля 12 тыс. мм.

ЧЭ́РАС, возера ў Міёрскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Мёрыца (прыток р. Зах. Дзвіна), за 6 км на ПнУ ад г. Міёры, каля в. Сушкі. Пл. 0,99 км^2, даўж. 3,29 км, найб. шыр. 530 м, найб. глыб. 12,8 м, даўж. берагавой лініі 7,74 км. Пл. вадазбору 7 км^2. Катлавіна лагчынага тыпу. Схілы катлавіны выш. 2—4 м, разараныя, месцамі пад хмызняком. Берагі нізкія, пясчаныя, месцамі ўкрыты хмызняком. Пойма невыразная. Шыр. паласы расліннасці 6—12 м да глыб. 1,5 м. Злучана пратокай з Грэцкім возерам. На берагах некалькі крыніц.

ЧЭ́РБЕРЫ, Херберт Чэрберы (Herbert Cherbury) Эдвард (3.3.1583, Эйтан-он-Северн, графства Шропшыр, Вялікабрытанія — 20.8.1648), англійскі філосаф, гісторык, паэт, грамадскі дзеяч; заснавальнік англ. *дэізму*. Ірл. (1624) і англ. (1629) пэр. Вучыўся ў Оксфардскім ун-це. У 1618—22 пасол у Францыі. У час грамадз. вайны 1642—46 у Англіі выступаў на баку раялістаў, але ў 1644 быў вымушаны капітуляваць. У гал. філас. працы «Пра ісціну» (1624) сцвярджаў, што вечная і універсальная ісціна даступная пазнанню, бо кожны чалавек надзелены Богам прыроджанымі псіхічнымі здольнасцямі, правільнае развіццё якіх прыводзіць да спасціжэння «агульных ідэй». Распрацаваў вучэнне пра «натуральную рэлігію розуму», у аснове якой ляжаць 5 «агульных ідэй»: існуе вышэйшае быццё; яго трэба шанаваць; дабрадзейнае жыццё — гал. форма шанавання; чалавек атрымлівае збаўленне праз раскаянне; пасля смерці кожнага чакае ўзнагарода ці пакаранне. На яго думку, ісціна («агульныя ідэі») была ўласціва раннім формам рэлігіі да часу спекуляцый на рэліг. ідэях з боку духавенства («Пра рэлігію язычнікаў», апубл. 1663). Аўтар «Аўтабіяграфіі» (1624, апубл. 1764), гіст. працы «Жыццё і цараванне караля Генрыха VIII» (1649), паэт. кн. «Выпадковыя вершы» (апубл. 1665) і інш. Рэліг.-філас. ідэі Ч. разглядалі П.Гасендзі, Р.Дэкарт; яго вучэнне паўплывала на станаўленне кембрыджскай школы платанізму і *шатландскай школы* ў філасофіі.

Н.Г.Кісялёва.

ЧЭ́РВЕН, Чэрвень, старажытнаславянскі горад на левым беразе р. Хучва, прытока Зах. Бута. Упершыню згадваецца ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 981. Быў цэнтрам Верхняга Пабужжа. Паводле вынікаў археал. раскопак 1950—60-х г. Ч. лакалізуецца на тэр. сучаснага г. Чэрмна (Польшча).

ЧЭ́РВЕНЬ (назву звязваюць з чырвоным колерам вішань і інш. ягад, што спеюць у Ч.), шосты месяц каляндарнага года (30 дзён), пачатак лета. У Ч. сонца праходзіць праз пункт летняга сонцастаяння (21 ці 22 ч.). 15 Ч. працягласць дня ў Мінску 17 гадз 8 мін, найб. выш. Сонца над гарызонтам — 59,4°. Сярэдняя сума сонечнай радыяцыі за месяц 624 МДж/м^2, радыяцыйны баланс максімальны (332 МДж/м^2). У Ч. найб. працягласць сонечнага зіяння (55—61% ад магчымага). На тэр. Беларусі сярэдняя месячная т-ра паветра 16,2 °С (15,7 °С на ПнУ, 17 °С на ПдУ). Ападкаў 65—80 мм за месяц, здараюцца навальніцы з градам. У Ч. часта выпаральнасць перавышае колькасць атм. ападкаў, што прыводзіць да атм. і глебавай засухі. У лясах і на лугах цвітуць многія расліны, настае сенакос. Каласуюць яравыя: пшаніца, ячмень, авёс. Зацвітае ранняя бульба. На палях вядуць барацьбу з пустазеллем, у садах — са шкоднікамі. У час цвіцення азімага жыта ў лесе паяўляюцца першыя летнія грыбы: падбярозавікі, падасінавікі, лісічкі, маслякі, сыраежкі, баравікі. У птушак вывадкі птушанят, у лісоў, вожыкаў, ласак, зброў — прыплод. Нерастуюць карпы, карасі, ляшчы, ліні. Шмат матылёў, пчол, мошак і жукоў.

ЧЭ́РВЕНЬ, горад, цэнтр Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл., на р. Чэрвенка (Ігуменка), каля аўтадарогі Мінск—Магілёў. За 62 км ад Мінска, 30 км ад чыг. ст. Пухавічы на лініі Мінск—Асіповічы. 10,8 тыс. ж. (2002). Прадпрыемствы харч., дрэваапр., лесанарыхтоўчай прамысловасці. *Чэрвеньскі краязнаўчы музей*. Брацкія магілы: сав. воінаў, сав. воінаў і партызан, ахвяр фашызму. Свята-Мікольская царква, касцёл Узвіжання Святога Крыжа.

Вядомы з 1387 пад назвай Ігумен у складзе Мінскага пав. ВКЛ. У 1-й пал. 15 ст. мястэчка, уласнасць Кежгайлаў, з 1447 — віленскага біскупа, царк. мястэчка. У час войнаў Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 і Паўночнай 1701—21 Ігумен разрабаваны і моцна разбураны. З 1793 у Рас. імперыі, з 1795 горад, цэнтр *Ігуменскага павета* (з 18.9.1923 *Чэрвеньскага павета*). 22.1.1796 горад атрымаў герб: на блакітным полі сярэбраны куст кветак і 5 залачоных пчол над ім. У вайну 1812 горад значна разбураны, у 1825 каля 900 ж., 263 дамы, 3 прадпрыемствы, 2 царквы, касцёл, 2 карчмы, 10 крам, рынак. У час паўстання 1863—64 тут дзейнічаў паўстанцкі атрад на чале з Б.*Свентаржэцкім*. У 1897 у Ігумене 4573 ж., у 1905 — 5121 ж., 664 жылыя дамы, вадзяны і паравы млыны, некалькі майстэрняў, 6 пач. школ, бальніца, аптэка і аптэчны магазін, штогод 6 кірмашоў. 18.9.1923 перайменаваны ў Ч. (ад назвы месяца). З 17.7.1924 цэнтр Чэрвеньскага р-на. 2.7.1941 акупіраваны ням. фашыстамі, якія ў горадзе і раёне загубілі 7561 чал.; дзейнічалі падп. групы. Вызвалены 2.7.1944 воінамі 1-га і 2-га Бел. франтоў сумесна з партызанамі ў ходзе *Мінскай аперацыі 1944*.

ЧЭ́РВЕНЬСКАЕ НАСТУПЛЕ́ННЕ 1917, наступальная аперацыя рас. войск на Паўд.-Зах. фронце (каманд. ген. А.Я.Гутар) 29.6—13.7.1917 у 1-ю сусв. вайну; састаўная частка летняга наступлення рас. арміі. Распачата Часовым урадам па просьбе саюзнікаў (Вялікабрытаніі, Францыі, ЗША) актывізаваць ваен. дзеянні супраць герм. і аўстра-венг. войск. 29 чэрв. артылерыя пачала падрыхтоўку атакі. 1 ліп. з раёнаў Золачаў — Бережаны ў наступленне пайшлі 11-я і 7-я рас. арміі ў напрамку на г. Львоў. Нягледзячы на перавагу ў сілах і сродках, наступленне 3 ліп. было спынена, 6 ліп. ў атаку перайшла 8-я армія (каманд. ген. Л.Г.*Карнілаў*), якая наносіла ўдар на ўчастку Галіч—Станіслаў (цяпер г. Івана-Франкоўск) у напрамку Калуш, Балехаў. Прарваўшы фронт праціўніка, 8-я армія захапіла больш за 7 тыс. палонных і 48 гармат, заняла гарады Галіч і Калуш, да 11 ліп. выйшла на рубеж р. Ломніца. Але 19 ліп. аўстра-герм. войскі, атрымаўшы падмацаванне (з Зах. фронту перакінута некалькі дывізій), з раёнаў Золачаў і Памаржаны нанеслі контрудар у напрамку г. Цярнопаль, прарвалі фронт 11-й арміі, што прымусіла 7-ю і 8-ю арміі таксама пачаць адыход на У. 21 ліп. камандаваць фронтам замест Гутара прызначаны Карнілаў. 28 ліп. рас. войскі замацаваліся на лініі Броды — Збараж — р. Збруч, значна адышоўшы на У ад рубяжа, які займалі да пачатку наступлення. Адзіным планам з Ч.н. былі звязаны наступленне на Рум. фронце і дапаможныя ўдары на Паўн. і Зах. франтах. Паспяховае наступленне 2-й рум. і 4-й рас. армій Рум. фронту (пачалося 22 ліп.) было прыпынена па загадзе вярх. галоўнакамандуючага А.Ф.*Керанскага* (27 ліп.). Наступленне 5-й арміі Зах. фронту (22 ліп.) з раёна Маладзечна ў напрамку Вільні і Паўн. фронту (23 ліп.) з раёна Якабштата (Екабпілса) у напрам-

Чэрвень. Плошча Свабоды.

ку Коўна (Каўнаса) поспеху не мела. У выніку праціўнік заняў Галіцыю, герм. дэсант у верасні акупіраваў а-вы Эзель і Даго ў Рыжскім заліве. Агульныя страты рас. войск на ўсіх франтах склалі больш за 150 тыс. чал. забітымі, параненымі і прапаўшымі без весткі. Ч.н. адцягнула на Усх. (рас.) фронт 13 герм. і 3 аўстр. дывізіі з Зах. (саюзніцкага) фронту. Правал Ч.н. выклікаў абурэнне рас. грамадскасці, што прывяло да *Ліпеньскага крызісу 1917.*

Літ.: История первой мировой войны, 1914—1918. Т. 2. М., 1975; Ростунов И.И. Русский фронт первой мировой войны. М., 1976; Строков А.А. Вооруженные силы и военное искусство в первой мировой войне. М., 1974; История войн. Т. 2. Ростов н/Д; М., 1997.

В.А.Юшкевіч.

ЧЭ́РВЕНЬСКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1848, узброенае паўстанне ў Парыжы 23—26 чэрв.; кульмінацыйны пункт *рэвалюцыі 1848 у Францыі.* Выклікана наступленнем рэакцыі на паліт. і эканам. заваёвы грамадзян. Непасрэдным штуршком да паўстання стала рашэнне ўрада выслаць з Парыжа рабочых нац. майстэрняў, у якіх працавала больш за 100 тыс. б. беспрацоўных. 22 чэрв. рабочыя (многія з іх мелі зброю) выйшлі на дэманстрацыю, якая 23 чэрв. перарасла ва ўзбр. паўстанне і барыкадныя баі. Ч.п. праходзіла пад лозунгам «дэмакр. і сац. рэспублікі». Урад сцягнуў у сталіцу 250-тысячную армію. Нац. сход, напалоханы размахам нар. выступлення, 24 чэрв. перадаў уладныя паўнамоцтвы ваен. міністру ген. Л.Э.*Кавеньяку.* 26 чэрв. паўстанне ў Парыжы ліквідавана. Салідарныя выступленні ў гарадах Дыжон, Бардо, Нант і інш. таксама падаўлены войскамі. У краіне пачаўся тэрор, у выніку якога 11 тыс. чал. забіта, 25 тыс. чал. арыштавана, 3,5 тыс. чал. выслана без суда, насельніцтва раззброена. Разгром Ч.п. прадвызначыў паражэнне рэвалюцыі 1848 у Францыі.

Літ.: Молок А.И. Июньские дни 1848 г. в Париже. М., 1948; Герцен А.И. С того берега // Собр. соч. М., 1955. Т. 6; Яго ж. Былое и думы. Ч. 5 // Там жа. М., 1956. Т. 10.

ЧЭ́РВЕНЬСКІ КРАЯЗНА́ЎЧЫ МУЗЕ́Й. Адкрыты 1.1.1992 у г. *Чэрвень* Мінскай вобл. Пл. экспазіцыі 294 м^2, каля 4,9 тыс. экспанатаў асн. фонду (2002). Мае раздзелы: стараж. Ігуменшчына, гісторыя пач. 20 ст. і 1-й сусв. вайны, міжваеннага часу, Вял. Айч. вайны, пасляваенны перыяд. Сярод экспанатаў археал. знаходкі з гарадзішчаў жал. веку каля вёсак Турэц і Гарадзішча, матэрыялы пра паўстанне 1863, устанаўленне сав. улады на Ігуменшчыне, дзейнасць партыз. руху і падполля ў Вял. Айч. вайну, пра землякоў Герояў Сав. Саюза, развіццё раёна ў пасляваенны перыяд; хатняе начынне 19 — пач. 20 ст. Музей праводзіць выстаўкі, прысвечаныя гісторыі Чэрвеня, творчасці М.Багдановіча, У.Караткевіча, мастака М.Станюты, твораў нар. мастакоў раёна.

Г.М.Аўласенка.

ЧЭ́РВЕНЬСКІ КРЫ́ЗІС 1917, другі (першы — *Красавіцкі крызіс 1917*) паліт. крызіс у Расіі пасля Люг. рэвалюцыі 1917, выкліканы супярэчнасцямі паміж рознымі сац. сіламі і паліт. партыямі па пытаннях міру, зямлі, барацьбы з эканам. разрухай. 1-ы Усерас. з'езд Саветаў (чэрв. 1917; пераважалі эсэры і меншавікі) адхіліў бальшавіцкі праект рэзалюцыі аб перадачы ўлады Саветам і выказаў давер *Часоваму ўраду.* Прэзідыум з'езда адмяніў прызначаную бальшавікамі на 10(23) чэрв. дэманстрацыю пратэсту і паспрабаваў сам 18.6(1.7).1917 правесці дэманстрацыю пад лозунгам «Давер Часоваму ўраду». Аднак дэманстранты ў Петраградзе (500 тыс. чал.), Рызе, Выбаргу, Рэвелі, Ніжнім Ноўгарадзе, Смаленску, Харкаве і інш. гарадах выйшлі на вуліцы пад бальшавіцкімі лозунгамі «Уся ўлада Саветам!», «Далоў 10 міністраў-капіталістаў!» і інш.

На Беларусі ў чэрв. 1917 масавыя мітынгі і дэманстрацыі прайшлі пад лозунгамі «Уся ўлада Саветам!», «Патрабуем тэрміновага заключэння міру!». Супраць запланаванага Часовым урадам *Чэрвеньскага наступлення 1917* выказаліся франтавы к-т Зах. фронту, многія салдацкія к-ты і вайск. часці. 18 чэрв. (1 ліп.), у дзень пачатку наступлення, дэманстрацыі пратэсту адбыліся ў вайск. часцях, у Мінску, Віцебску, Гомелі, Оршы, Бабруйску, Слуцку і інш. На Зах. фронце наступленне фактычна было сарвана. На Паўд.-Зах. фронце яно спачатку развівалася паспяхова і гэта спыніла Ч.к., але неўзабаве пацярпела поўны правал, што выклікала новы, *Ліпеньскі крызіс 1917.*

Літ.: История Великой Октябрьской социалистической революции. М., 1962. С. 72—78; Злоказов Г.И. Меньшевистско-эсеровский ВЦИК Советов в 1917 г. М., 1997.

ЧЭ́РВЕНЬСКІ ПАВЕ́Т, адм.-тэр. адзінка ў 1923—24 у БССР. У сувязі з перайменаваннем цэнтра *Ігуменскага павета* г. Ігумен у *Чэрвень* павет таксама з 18.9.1923 змяніў назву. Складаўся з 20 валасцей. 17.7.1924 павет скасаваны, воласці перададзены ў Бабруйскую, Барысаўскую і Мінскую акругі.

ЧЭ́РВЕНЬСКІ РАЁН. Размешчаны на ПдУ Мінскай вобл. Утвораны 17.7.1924. Пл. 1,6 тыс. км^2. Нас. 37,1 тыс. чал. (2003), гарадскога 43%. Сярэдняя шчыльн. 23 чал. на 1 км^2. Цэнтр — г. *Чэрвень.* Раён уключае г.п. *Смілавічы*, 197 сельскіх нас. пунктаў, Смілавіцкі пасялковы Савет, 10 сельсаветаў: Вайнілаўскі, Валевачоўскі, Грабянецкі, Калодзежскі, Кліноцкі, Лядскі, Раваніцкі, Руднянскі, Смілавіцкі, Хутарскі.

Тэр. раёна ў межах *Цэнтральнабярэзінскай раўніны.* Паверхня пласкахвалістая, каля 70% яе на выш. 180—200 м і 30% — 160—180 м. Найвыш. пункт 209 м (на Пн ад в. Валевачы). Агульны нахіл з ПнЗ на ПдУ. Карысныя выкапні: торф, пясчана-жвіровы матэрыял, буд. пяскі, цагельныя суглінкі і гліны, сапрапель. Сярэдняя т-ра студз. -6,9 °С, ліп. 17,9 °С. Ападкаў 602 мм за год. Вегетац. перыяд 187 сут. Найб. р. Волма з прытокам Гаць, Уса з Гануткай і Дабрыцай, Уша. Азёры: Пясочнае, Дзікае, Лукава. Вадасх. Волма. Глебы с.-г. угоддзяў: дзярнова-падзолістыя (33,3%), дзярнова-падзолістыя глееватыя (16,6%), тарфяна-балотныя (11%) і інш. Пад лесам 38,6% плошчы. Пераважаюць хваёвыя, бярозавыя, яловыя, чорнаальховыя, асінавыя, дубовыя лясы. Штучныя насаджэнні (каля 25%) пераважна хваёвыя. Пад балотамі 1% плошчы (найб. Краснае, Рудзянец). На тэр. раёна біял. заказнік мясц. значэння Чэрвеньскі; ахоўныя тарфянікі: Падастрэўе, Краснае, Дуброва, Плінтаўка, Дубкі, Рудзянец, Валмянка, Падор, Уса, у пойме р. Волма, Крысін Дуб, Вялікае, Кажамячышча, Чэрвеньскае, Салажкі. Помнікі прыроды: рэсп. значэння, парк «Раванічы», хвоі чорныя ў г.п. Смілавічы; мясц. значэння — паркі «Смілавічы», «Убель» і «Калодзежы».

Агульная пл. с.-г. угоддзяў 81 тыс. га, з іх асушаных 26 тыс. га. На 1.9.2003 у раёне 6 калгасаў, 4 раённыя унітарныя с.-г. прадпрыемствы, рэсп. унітарнае с.-г. прадпрыемства, «Эксперым. база «Натальеўск», 9 с.-г. вытв. кааператы-

ваў, 37 фермерскіх гаспадарак, аграрнапрамысл. прадпрыемства «Чэрвеньскае». Сельская гаспадарка спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, птушкагадоўлі, вырошчванні збожжавых і кармавых культур, рапсу, лёну, бульбы. Прадпрыемствы прам-сці: дрэваапр. (мэбля, піламатэрыялы), нафтаперапр. (нафтабітум), харч. (цэльнамалочныя прадукты, сушаная агародніна, віно, безалкагольныя напіткі), каап. (хлебабулачныя і каўбасныя вырабы), лёгкай (валены абутак, скураны тавар); рыбгас «Волма», лясгас. Па тэр. раёна праходзяць аўтадарогі Мінск—Чэрвень—Магілёў, Чэрвень—Мар'іна Горка, Чэрвень—Смалявічы і інш. У раёне 17 сярэдніх, 10 базавых, 3 пач., 1 вячэрняя школа, гімназія, дом-прытулак, с.-г. прафес. ліцэй, дзярж. агр. каледж, ПТВ, 30 дашкольных устаноў, 24 клубы, 32 б-кі, 6 бальніц, 2 амбулаторыі, 23 фельч.-ак. пункты, 1 санаторый. *Чэрвеньскі краязнаўчы музей*, музей кампазітара С.Манюшкі ў пас. Азёрны. Помнікі архітэктуры: касцёл Антонія (канец 18 — пач. 19 ст.) і палацава-паркавы комплекс (2-я пал. 19 ст.) у в. Раванічы. Гіст. помнікі: мемарыяльны комплекс

«Разгром» (1982—84) за 3,5 км на ПнЗ ад в. Раваніцкая Слабада на месцы базіравання ў 1942—44 міжраённага падп. камітэта КП(б)Б Мінскай зоны, Чэрвеньскіх падп. райкомаў КП(б)Б і ЛКСМБ, штаба партыз. брыгады «Разгром». Выдаецца газ. «Раённы веснік».

Літ.: Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Мінская вобл. Кн. 2. Мн., 1987; Памяць: Гіст.-дак. хроніка Чэрвеньскага р-на. Мн., 2000. *Г.Ю.Гамеза, Р.Р.Паўлавец.*

ЧЭ́РВІ (Vermes), зборная група беспазваночных жывёл. 5 тыпаў: *кольчатыя чэрві, немертыны, першаснаполасцевыя чэрві, плоскія чэрві, скрэбні.* Каля 500 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды. Жывуць свабодна або паразітуюць (гл. *Гельмінты*); узбуджальнікі *гельмінтозаў* жывёл, чалавека і раслін. На Беларусі найб. адзначаюцца прадстаўнікі плоскіх і першаснаполасцевых Ч. Падзяляюць на ніжэйшых, або скалецыд, і вышэйшых Ч.

Даўж. ад 80 мкм да 30 м, без канечнасцей і ясна выражанай галавы. Маюць моцную мускулатуру (скурна-мускульны мяшок). Двухбакова-сім. жывёлы. Скалецыды маюць несегментаванае цела з першаснай поласцю і протанефрыдыяльнай выдзяляльнай сістэмай, крывяносная і дыхальная сістэмы адсутнічаюць (круглыя і плоскія чэрві, немертыны, першаснаполасцевыя). Вышэйшыя Ч. маюць сегментаваную будову, другасную поласць цела *(цэлом)*, крывяносную, дыхальную, метанефрыдыяльную выдзяляльную сістэмы (кольчатыя Ч.). Фізіял. асаблівасцямі блізкія да *членістаногіх*.

ЧЭ́РКАС Леанід Антонавіч (н. 1.1.1937, в. Доктаравічы Капыльскага р-на Мінскай вобл.), бел. матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1987), праф. (1988). Скончыў БДУ (1959). З 1964 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі (у 1969—71 і 1981—98 заг. кафедры). Навук. працы па якаснай тэорыі дыферэнцыяльных ураўн., тэорыі нелінейных ваганняў перыяд. сістэм. Распрацаваў алг. метады даследавання лімітавых цыклаў двухмерных аўтаномных сістэм.

Тв.: Условия центра для одного уравнения Льенара // Дифференциальные уравнения. 1976. Т. 12, № 2; Методы оценки числа предельных циклов автономных систем // Там жа. 1977. Т. 13, № 5; Функция Дюлака полиномиальных автономных систем на плоскости // Там жа. 1997. Т. 33, № 5.

ЧЭ́РКАС Людвіг Станіслававіч (9.12.1923, г. Полацк Віцебскай вобл. — 10.4.2002), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў Ноўгарад-Валынскае ваен. пяхотнае вучылішча (1942), Ваен. акадэмію бранятанк. і механізаваных войск (1954). У Чырв. Арміі з чэрв. 1941. З ліп. 1941 на Зах., 2-м Укр. і 1-м Бел. франтах. Удзельнік бітвы пад Масквой, вызвалення Украіны, Беларусі, Польшчы, баёў за Берлін. Камандзір кулямётнай роты ст. лейтэнант Ч. вызначыўся 19.1.1945 у баях за горад Радзееў (Польшча): штурмавая група на чале з ім прарвала ўмацаваную абарону праціўніка і прабілася ў горад, цяжка паранены Ч. не пакінуў

Л.С.Чэркас.

поля бою. Удзельнік Парада перамогі 1945 у Маскве. Да 1958 у Сав. Арміі, потым у НДІ.

ЧЭРКЕ́ЗАЎ Мухамед (1.1.1911, Ашгабат — 23.7.1993), туркменскі акцёр. Нар. арт. Туркменістана (1955). Нар. арт. СССР (1980). Скончыў Туркм. маст. тэхнікум. З 1932 працаваў у Туркм. т-ры драмы імя К.Маланепеса. Сярод роляў: Байрам («Сям'я Алана» Г.Мухтарава), Саліхбай («Бай і батрак» Х.Хамзы), Атэла, Глостэр («Атэла», «Кароль Лір» У.Шэкспіра), Дудукін, Вышнеўскі («Без віны вінаватыя», «Даходнае месца» А.Астроўскага), Мантанелі («Авадзень» паводле Э.Войніч). Здымаўся ў кіно: «Сын джыгіта», «Крушэнне эмірата», «Махтумкулі», «Чалавек за бортам», «Дрэва Джамал», «Кароткія рукавы». Дзярж. прэмія СССР 1951. Дзярж. прэмія Туркменістана 1970.

ЧЭРКЕ́СК, горад, сталіца Карачаева-Чэркесіі, у Расіі, на правым беразе р. Кубань. Засн. ў 1804 як ваен. ўмацаванне. Да 1931 станіца Баталпашынская, з 1934 наз. Сулімаў, з 1937 — Яжова-Чэркеск, з 1939 сучасная назва. 120,7 тыс. ж. (2001). Чыг. станцыя. Пач. пункт Ваенна-Сухумскай (аўтамаб.) дарогі. Прам-сць: хім., машынабудаванне і металаапрацоўка (халадзільнае абсталяванне, нізкавольтная апаратура), лёгкая, харч.; вытв-сць буд. матэрыялаў. Політэхн. ін-т. Драм. тэатр. Гіст.-культ. і прыродны музей-запаведнік (да 1988 — краязнаўчы музей).

ЧЭРКЕ́СЫ (саманазва а д ы г е), адзін з народаў *Карачаева-Чэркесіі* (42 тыс. чал., 1997). Жывуць таксама ў інш. рэгіёнах Рас. Федэрацыі, Турцыі, краінах Паўд.-Зах. Азіі і Паўн. Афрыкі. Усяго ў Рас. Федэрацыі 50,7 тыс. чал. (1995). Агульная колькасць 270 тыс. чал. (1995). Гавораць на кабардзіна-чэркескай мове. Вернікі — мусульмане-суніты. Ч. часам наз. усіх выхадцаў з Паўн. Каўказа.

ЧЭ́РНЕЎКА, вёска ў Дрыбінскім р-не Магілёўскай вобл., на р. Бася. Цэнтр сельсавета і с.-г. вытв. кааператыва. За 25 км на З ад г.п. Дрыбін, 40 км ад Магілёва, 33 км ад чыг. ст. Цёмны Лес. 358 ж., 155 двароў (2003). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Магіла ахвяр фашызму.

Паводле пісьмовых крыніц вядома з 1636 як сяло Чарна ў складзе Бардзілаўскага войтаўства Магілёўскай эканоміі Аршанскага пав. ВКЛ. З 1695 у Плешчыцкім войтаўстве Магілёўскай эканоміі, вёска Чарнаўцы з засценкам Плябаншчызна, 30 валок зямлі, 2 млыны, карчма. У 1777 мястэчка і вёска Чарніца (яна ж Чарняўка) у Рас. імперыі. У 178[illegible] мястэчка ў Чавускім пав., 165 ж., 32 двары, маёнтак, царква, уладанне графа Зорыча, пазней — Алышэўскіх, Вайзбунаў, у 1841—44 у арэндзе ў памешчыцы Кубліцкай. У 1885 сяло, цэнтр воласці, 195 ж., 24 двары, школа, царква, 2 яўр. малітоўныя дамы, 6 крам. У 1897 побач размяшчаліся аднайм. сяло (243 ж., 37 двароў), мястэчка (444 ж., 51 двор) і маёнтак (уладанне Л.Ф.Мацкевіча, 16 ж.). У сяле знаходзіліся валасное праўленне, нар. вучылішча (з 1874), прытулак для бедных, цэнтр. хлебазапасны магазін; у мястэчку — крупадзёрка, мураваная царква, 2 яўр. малітоўныя дамы, 14 крам, карчма. З 1924 цэнтр сельсавета ў Лупалаўскім р-не, з 1931 — у Дрыбінскім, Чавускім і Горацкім р-нах, у 1935—59 і з 1989 — у Дрыбінскім, у 1959—89 — у Шклоўскім р-нах. У Вял. Айч. вайну ням. фашысты часткова спалілі Ч., загубілі 525 жыхароў. *В.М.Князева.*

ЧЭ́РНЕЎСКІ, біялагічны заказнік рэсп. значэння ў Барысаўскім р-не Мінскай вобл. Засн. ў 1979 для захавання ў прыродным стане месцаў росту журавін. Пл. 1 тыс. га. Размешчаны на вярховых балотах Маленькі Машок і Навасельскі Мох і на пераходным балоце Крывы Мох. Узгорыста-хвалістая водна-ледавіковая раўніна з дзюнамі, марэннымі ўзгоркамі, катлавінамі. Глебы тарфянабалотныя (глыб. торфу да 2,9 м, у сярэднім — 1,6 м) і дзярнова-падзолістыя супясчаныя. Пераважаюць хваёва-кусцікава-сфагнавыя фітацэнозы з пераважай журавін, на мінер. участках пашараны хваёвыя, яловыя, бярозавыя лясы. *П.І.Лабанок.*

ЧЭ́РНЕЦІ (Aythya), род вадаплаўных птушак сям. качыных атр. гусепадобных. Да Ч. часам адносяць і *нырцоў*. Пашыраны ва ўмераных шыротах Еўразіі і Паўн. Амерыкі. На Беларусі 4 віды Ч.: белавокая, ці *белавокі нырэц*, занесены ў Чырв. кнігу, чырвонагаловая, ці

Чэрнеці: 1 — марская; 2 — чырвонагаловая (а — самка, б — самец).

нырэц (A. ferina), марская (A. marila), чубатая (A. fuligula).

Даўж. да 50 см, маса да 1,4 кг. Самкі цёмна-шэрыя са стракацінамі. Апярэнне самцоў больш яркае, у розных відаў адрозніваецца. Дзюба доўгая, пляскатая. Нясуць 6—15 (часцей 8—12) яец. Кормяцца воднай расліннасцю, рыбай, малюскамі, ракападобнымі, лічынкамі насякомых і інш. Добра ныраюць. Аб'екты палявання. Іл. гл. таксама да арт. *Белавокі нырэц, Нырцы.*

ЧЭ́РНІ, вёска ў Брэсцкім р-не. Цэнтр сельсавета і камунальнага унітарнага с.-г. прадпрыемства. За 9 км на ПнУ ад Брэста. 2166 ж., 763 двары (2003). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Царква св. апостала Іаана Багаслова. Брацкая магіла сав. воінаў.

ЧЭ́РНІ (Czerny) Карл (Карэл; 20 ці 21.2.1791, Вена — 15.7.1857), аўстрыйскі піяніст, кампазітар, педагог. Паводле паходжання чэх. Вучыўся ў свайго бацькі Венцэля Ч., у *Л.Бетховена* (1800—03). З 1800 выступаў як піяніст. Аўтар больш як 1000 твораў розных жанраў і для рознага складу выканаўцаў (оперы, месы, рэквіемы, інш. арк. і камерна-інстр. творы, хары, песні, музыка да драм. спектакляў). Зрабіў значны ўклад у развіццё інструктыўнай л-ры для фартэпіяна. Ажыццявіў рэдакцыі «Добра тэмпераванага клавіра» І.С.Баха, фп. санат Дж.Скарлаці, пералажыў шэраг опер і сімф. твораў для фп. Сярод вучняў Ф.*Ліст*, С.Тальберг.

Літ.: Терентьева Н.К.Черни и его этюды. Л., 1978.

ЧЭ́РНІКАЎШЧЫНА, вёска ў Фаніпальскім с/с Дзяржынскага р-на Мінскай вобл., на р. Уса. Цэнтр калгаса. За 9 км на ПнУ ад Дзяржынска, 35 км ад Мінска, 6 км ад чыг. ст. Фаніпаль. 344 ж., 126 двароў (2003). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Каля вёскі курганны могільнік (9—11 ст.) і курган.

ЧЭ́РНЫ (Černý) Адольф (19.8.1864, г Градзец-Кралаве, Чэхія — 27.12.1952), чэшскі пісьменнік, вучоны-славіст. Д-р філал. н. (1946). Чл. Чэш. акадэміі навук і мастацтваў (1925). Скончыў настаўніцкі ін-т (1883). У 1898 заснаваў час. «Slovanský přehled» («Славянскі агляд»), у якім змяшчаліся матэрыялы пра грамадскае, культ. і літ. жыццё слав. народаў, у т.л. і беларусаў. У 1898—1904 заг. Этнагр. музея, у 1901—20 выкладчык слав. моў Карлава ун-та ў Празе. У 1890-я г. наведваў Беларусь, запісваў бел. фальклор («Беларускія песні з Дзісенскага павета Віленскай губерні», 1895). Надрукаваў арт. «Беларускі часопіс» (1906) і «З Беларусі» (1909), прысвечаныя бел. газетам «Наша доля» і «Наша ніва». У арт. «Беларускія нацыянальныя і культурныя імкненні ў 1909—1910 гг.» (1911) характарызаваў літ. рух на Беларусі. Аўтар кніг і артыкулаў пра славян «Славянства ў час сусветнай вайны» (1919), «Выбраныя паэтычныя творы» (т. 1—4, 1928—29). Пераклаў на чэш. мову асобныя вершы Я.Купалы, Я.Коласа, Цёткі.

І.У.Саламевіч.

ЧЭ́РНЫ-СТАФА́НСКАЯ, Чэрны-Стэфаньская (Czerny-Stefańska) Галіна (н. 30.12.1922, г. Кракаў, Польшча), польская піяністка. Вучылася ў Варшаўскай кансерваторыі (1935—39), Вышэйшай муз. школе ў Кракаве (1946—50). З 1955 салістка Кракаўскай філармоніі. З 1976 выкладае ў Вышэйшай муз. школе ў Познані. Канцэртавала як салістка і ансамблістка, у т.л. з мужам піяністам Л.Стафанскім і дачкой піяністкай і клавесіністкай Э.Стафанскай-Луковіч. Лаўрэат Міжнар. конкурсу піяністаў імя Ф.Шапэна (1-я прэмія, 1949, Варшава). Дзярж. прэміі Польшчы 1950, 1952.

ЧЭ́РНЯ, другая назва р. *Скарбянка* ў Воранаўскім і Шчучынскім р-нах Гродзенскай вобл.

ЧЭ́РНЯ Хведар (Фёдар Мікалаевіч; 10.6.1939, в. Лінкі Валожынскага р-на Мінскай вобл. — 16.3.1983), бел. паэт. Скончыў БДУ (1966), Мінскую Вышэйшую парт. школу (1969). Працаваў на Бел. радыё, з 1969 у выд-ве «Беларусь», з 1972 у выд-ве «Мастацкая літаратура». Друкаваўся з 1957. Яго творам уласцівы філас. асэнсаванне ўзаемаадносін чалавека з часам, высокая грамадзянскасць, аптымізм. Аўтар зб-каў «Добрай раніцы, людзі!» (1966), «Дабрэе свет» (1968), «Сады юнацтва» (1972), «Настрой» (1974), «Ваколіца» (1976), «Святло рамонкаў» (1981), кніг для дзяцей «Песня Сабіны» (1971), «На Сонечнай вуліцы» (1973), сатыр. зб. «Ажаніся, не журыся...» (1979), паэмы «Размова з памяццю» (1970).

Тв.: На скрыжаваннях памяці. Мн., 1982; Музыка дарог. Мн., 1984. *У.А.Паўлаў.*

ЧЭ́РСКАГА ХРЫБЕ́Т, ланцугі Чэрскага, горная сістэма ў Рэспубліцы Саха (Якуція) і Магаданскай вобл.



Расіі. Распасціраецца ад ніжняга цячэння р. Яна да вярхоўяў р. Калыма на 1500 км, шыр. да 400 км. Гал. хрыбты: Хадаранья, Тас-Хаяхтах, Чэмалгінскі, Курундзя, Чыбагалахскі, Баронг і інш. Найвыш. г. Перамога (3147 м). Утвораны сістэмай асобных хрыбтоў, масіваў, пласкагор'яў і міжгорных упадзін-грабенаў. Пераважаюць сярэдневышынныя горы. Найб. ўпадзіны Мома-Селеняхская, Туастахская. Горная сістэма складзена з метамарфічных парод пратэразою і ніжняга палеазою, сланцаў і пясчанікаў мезазою, прарваных інтрузіямі юрскіх гранітаў. Больш за 350 ледавікоў, агульная пл. 157 км^2; формы мярзлотнага рэльефу. Радовішчы золата, волава, кам. вугалю. Схілы гор укрыты лістоўнічнай тайгой. Вышэй мяжы лесу (650 м на Пд, 250—400 м на Пн) пояс кедравага сланіку, хмызняковай вольхі, горнай тундры; на вяршынях найб. высокіх хрыбтоў камяністыя пустыні. У далінах рэк гаі з таполі і чазеніі. Хрыбет названы ў гонар І.Дз.*Чэрскага*.

ЧЭ́РСКАЯ МІХА́ЙЛАЎСКАЯ ЦАРКВА́, помнік драўлянага дойлідства ў в. Чэрск Брэсцкага р-на. Пабудавана ў 1701. Царква складаецца з квадратнага ў плане асн. зруба, завершанага дахам з галоўкай, і больш вузкага зруба з 3-гранай алтарнай ч., накрытага вальмавым дахам з галоўкай. Да гал. фасада прыбудавана веранда, каля алтара — рызніца. Сцены вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі. Перад царквой пастаўлена зрубна-каркасная 3-ярусная званіца-брама, ніжні ярус якой — чацверыковы зруб, ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі, верхні — каркасны (таксама чацверыковы), завершаны шатровым дахам, прамежкавы — вырашаны шатровым дахам у выглядзе развітага прычолка, які на зах. і ўсх. фасадах мае трапецападобныя верт. шчыты з 4 арачнымі праёмамі з дэкар. панэллю.

Чэрская Міхайлаўская царква.

ЧЭ́РСКІ Іван Дзяменцьевіч (Ян Дамінікавіч; 15.5.1845, в. Свольна Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. — 7.7.1892), геолаг, географ, даследчык Сібіры. Вучыўся ў Віленскім дваранскім ін-це (1860—63). За ўдзел у паўстанні 1863—64 выключаны з 4-га курса, пазбаўлены дваранскага звання, грамадзянскіх правоў і высланы ў Сібір салдатам. У 1869 вызвалены па хваробе ад вайск. службы. У 1871 запрошаны Сібірскім аддз. Рус. геагр. т-ва ў Іркуцк, дзе працаваў пад кіраўніцтвам А.Л.*Чаканоўскага*. Праводзіў геал. і палеанталагічныя даследаванні ў Саянах, Прыбайкаллі, у бас. Ангары і Ніжняй Тунгускі, склаў першую геал. карту ўзбярэжжа воз. Байкал, даследаваў бас. р. Селенга (Бурацыя). У 1885 па запрашэнні С.-Пецярбургскай АН пераехаў у С.-Пецярбург. У 1891 узначаліў экспедыцыю ў раён рэк Калыма і Індыгірка. Памёр у час даследаванняў нізоўяў Калымы. Выказаў ідэю эвалюц. развіцця рэльефу, прапанаваў адну з першых тэктоніка-палеагеагр. схем унутр. раёнаў Сібіры, якую пазней выкарыстаў і развіў аўстр. геолаг Э.*Зюс* у працы «Аблічча Зямлі». Узнаг. 3 залатымі медалямі Рус. геагр. т-ва. Яго імем названы сістэма горных хрыбтоў у Паўн.-Усх. Сібіры, хрыбет у Забайкаллі і інш.,.*Іркуцкае таварыства беларускай культуры*.

Літ.: Алдан-Семенов А.И. Черский. М., 1963; Грицкевич В.П. Путешествия наших земляков. Мн., 1968; Ярмоленка В.А. За далягляда Айкумены. Мн., 1995.

В.А.Ярмоленка.

ЧЭ́РСКІ Мікалай Васілевіч (2.2.1905, г.п. Ольга Прыморскага краю, Расія — 2.2.1994), расійскі вучоны ў галіне распрацоўкі радовішчаў нафты і газу. Акад. Рас. АН (1981, чл.-кар. 1968). Герой Сац. Працы (1975). Скончыў Ін-т механікаў воднага транспарту (1931; г. Уладзівасток), Акадэмію нафтавай прам-сці (1951). З 1964 старшыня прэзідыума Якуцкага філіяла АН СССР, адначасова з 1973 дырэктар Ін-та фізіка-тэхн. праблем Поўначы. З 1980 дырэктар Ін-та горнай справы Поўначы. Навук. працы па канструкцыях газавых свідравін, распрацоўцы метадаў падліку запасаў і эксплуатацыі газавых і газагідратных радовішчаў, абгрунтаванні ўплыву тэктонасейсмічных працэсаў на ўтварэнне і акумуляцыю вуглевадародаў.

Тв.: Испытание разведочных скважин в СССР. М., 1964; Пути освоения газогидратных залежей суши и морей СССР. М., 1982; Формирование Южно-Якутских ТПК. Новосибирск, 1984.

ЧЭ́РЦЕНЬ, рака ў Ельскім і Мазырскім р-нах Гомельскай вобл., левы прыток р. Славечна (бас. р. Прыпяць). Даўж. 43 км. Пл. вадазбору 492 км^2. Пачынаецца меліярац. канавай за 1 км на ПдУ ад в. Казіміраўка Ельскага р-на. Рэчышча каналізаванае. Берагі выш. 1,5—2 м, спланаваныя. Выкарыстоўваецца як водапрыёмнік меліярац. сістэм.

ЧЭ́РЧАС Хаім Аронавіч (17.4.1916, в. Градзянка Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл. — 9.10.1992), бел. хімік-арганік. Д-р хім. н. (1967), праф. (1969). Скончыў БДУ (1939). З 1947 у Ін-це хіміі, з 1959 у Ін-це фізіка-арган. хіміі АН Беларусі. У 1967—90 у БПІ. Навук. працы па хіміі прыродных злучэнняў і рэдказямельных металаў. Распрацаваў спосабы вылучэння і ідэнтыфікацыі смаляных к-т і інш. тэрпеноідаў з бальзамаў мясц. хвойных парод, метады атрымання цэравых солей аліфатычных к-т, сілікатаў рэдказямельных металаў і інш.

І.Дз.Чэрскі.

М.В.Чэрскі.

У.Л.С.Чэрчыль.

Тв.: Исследование химического состава кислотной части живицы различных хвойных (разам з І.І.Бардышавым) // Синтетические продукты из канифоли и скипидара. Мн., 1964; Каталитические свойства соединений редкоземельных металлов. Мн., 1977 (у саўт.).

Я.Г.Міляшкевіч.

ЧЭ́РЧЫЛ (Churchill), 1) рака ў цэнтр ч. Канады. Даўж. 1600 км, пл. бас. 282 тыс. км^2. Выцякае з воз. Чэрчыл, упадае ў Гудзонаў заліў. Рэчышча — шэраг азёрападобных расшырэнняў, падзеленых парожыстымі ўчасткамі. У сістэме Ч. шмат буйных азёр (Аленевае, Нортэрн-Індыян-Лейк, Саўтэрн-Індыян-Лейк, Ла-Ронж і інш.). Гал. прыток — Бівер (справа). Вясенне-летняе разводдзе. Сярэдні расход вады 1200 м^3/с. Ледастаў каля 8 мес. ГЭС Айленд-Фолс. У вусці порт Чэрчыл. 2) Рака ў Канадзе, на п-ве Лабрадор. Да 1965 наз. Гамільтан. Даўж. 560 км, пл. бас. 80 тыс. км^2. Ажыццяўляе сцёк вял. групы азёр у цэнтр. ч. Лабрадора. Упадае ў воз. Мелвіл, якое злучана пратокай з зал. Гамільтан Атлантычнага акіяна. Вадаспады (Чэрчыл-Фолс, Маскрат-Фолс), парогі (Порк'юпайн, Муні). Сярэдні расход вады 1580 м^3/с. Вадасх. Чэрчыл. ГЭС.

ЧЭ́РЧЫЛЬ, Чорчыл (Churchill) Уінстан Леанард Спенсер (30.11.1874, маёнтак Блэнхейм, графства Оксфардшыр, Вялікабрытанія — 24.1.1965),

дзяржаўны і паліт. дзеяч Вялікабрытаніі. З роду герцагаў Мальбара. Скончыў ваен. акадэмію ў Сандхерсце, з 1895 служыў афіцэрам у арміі, удзельнічаў у калан. войнах; у час *англа-бурскай вайны 1899—1902* ваен. карэспандэнт. З 1900 дэп. парламента ад *Кансерватыўнай партыі Вялікабрытаніі*; у 1904 перайшоў у Ліберальную партыю, ад якой у 1905 зноў выбраны ў парламент (у 1924 вярнуўся да кансерватараў). У 1908—22, 1924—29, 1939—43 на міністэрскіх пасадах. Адзін з арганізатараў ваен. інтэрвенцыі супраць Сав. Расіі ў 1918—19. У 1940—55 лідэр кансерватыўнай партыі. У 1940—45 прэм'ер-міністр. Нягледзячы на адмоўнае стаўленне да СССР, разумеў, што без яго дапамогі Вялікабрытанія не здолее перамагчы ў 2-й сусв. вайне і таму выступіў адным з арганізатараў *антыгітлераўскай кааліцыі*. У ліп. 1941 урад Ч. падпісаў з СССР пагадненне аб сумесных дзеяннях супраць фаш. Германіі, у маі 1942 — брыт.-сав. дагавор аб саюзе ў вайне супраць Германіі і яе саюзнікаў у Еўропе, а таксама аб супрацоўніцтве і ўзаемадапамозе пасля вайны. Адцягваў адкрыццё 2-га фронту ў Зах. Еўропе. Удзельнік канферэнцый кіраўнікоў Вялікабрытаніі, ЗША і СССР у Тэгеране (1943), Ялце і Патсдаме (1945). Пасля вайны заклікаў да стварэння ваен.-паліт. блокаў супраць СССР. У 1951—54 зноў прэм'ер-міністр, адначасова (1951—52) міністр абароны. Імкнуўся да захавання Брыт. калан. імперыі і ўстанаўлення цесных узаемаадносін паміж Вялікабрытаніяй і яе б. калоніямі. Аўтар гіст.-мемуарных прац. Нобелеўская прэмія па л-ры 1953.

Тв.: Рус. пер. — Вторая мировая война. Т. 1—6. М., 1997—98.

Літ.: Роббинс К. Черчилль: Пер. с англ. Ростов н/Д; М., 1997; Уткин А.И. Черчилль: Победитель двух войн. Смоленск, 2003. *М.А.Бандарэнка.*

ЧЭ́РЫКАЎ, горад, цэнтр Чэрыкаўскага р-на Магілёўскай вобл., на р. Сож, на скрыжаванні аўтадарог Магілёў—Касцюковічы і Бабруйск—Крычаў. За 77 км ад Магілёва, 32 км ад чыг. ст. Крычаў. 8,6 тыс. ж. (2002). Прадпрыемствы харч., буд. матэрыялаў, лесанарыхтоўчай прам-сці. *Чэрыкаўскі гісторыка-краязнаўчы музей*. Брацкія магілы сав. воінаў і партызан, ахвяр фашызму. Помнік архітэктуры — будынкі бальніцы (19—20 ст.). Помнік прыроды — *Чэрыкаў*.

У пісьмовых крыніцах вядомы з 16 ст. як цэнтр воласці Магілёўскай эканоміі ВКЛ. Да 17 ст. вёска Магілёўскага староства, з 1604 горад. З 1641 мястэчка з магдэбургскім правам, меў герб: у блакітным полі сярэбраны мур з 3 вежамі, у цэнтральнай — брама з рыцарам, узброеным дзідай. У 1649 у Ч. каля 2 тыс. ж. У *антыфеадальную вайну 1648—51* у пач. кастр. 1648 казакі пад камандаваннем Крывашапкі занялі Ч., адкуль рабілі наезды на шляхецкія маёнткі Мсціслаўскага ваяв. Казакоў у Ч. разбіў атрад полацкіх шляхціцаў на чале з кн. Лукомскім. У *вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67* Ч. спустошаны; хутка адноўлены, з 1678 зноў меў статус горада, цэнтр павета Мсціслаўскага ваяв. У Паўночную вайну 1700—21 пацярпеў (1708) ад шведскіх войск. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) Ч. у складзе Рас. імперыі, з 1773 цэнтр *Чэрыкаўскага павета* Магілёўскай губ., у 1796—1802 у складзе Беларускай губ. У 1781 атрымаў герб: на чырв. полі «Пагоня». У 1787 у горадзе больш за 3 тыс. ж., 300 дамоў, школа, 2 царквы. У 1789 адкрыта 2-класнае нар. вучылішча. У канцы 18 ст. праз Ч. пракладзены тракт Магілёў—Чавусы—Крычаў—Мсціслаў, у 19 ст. — Маскоўска-Варшаўская шаша. У горадзе адбываліся кансхія кірмашы, на Сажы былі 3 прыстані. У сярэдзіне 19 ст. працаваў цукр. з-д (больш за 200 рабочых). У час паўстання 1863—64 Я.В.Жукоўскі сфарміраваў тут паўстанцкі атрад, які пазней злучыўся з Горацкім атрадам Л.М.*Звяждоўскага*. У 1897 у Ч. 5,2 тыс. ж., пенькатрапальнае прадпрыемства (16 рабочых), 3-класнае гар. вучылішча (1902). У 1904 былі 23 дробныя прадпрыемствы (73 рабочыя), 162 рамеснікі, бальніца на 20 ложкаў. У 1919—23 цэнтр павета, у 1923—24 у Калінінскім пав. Гомельскай губ. РСФСР. З 17.7.1924 цэнтр *Чэрыкаўскага раёна* ў складзе БССР, у Калінінскай (з 1924), Магілёўскай (1927—30) акругах, з 1938 у Магілёўскай вобл. У 1939 — 6,4 тыс. ж., вет. тэхнікум. У Вял. Айч. вайну у горадзе быў створаны батальён нар. апалчэння. З 17.7.1941 акупіраваны ням. фашыстамі, якія загубілі ў Ч. і раёне 1118 чал. З 1942 тут дзейнічала падп. антыфаш. арг-цыя (кіраўнік І.П.*Дзенісенка*). Вызвалены 1.10.1943 воінамі 50-й арміі Бранскага фронту ў ходзе *Бранскай аперацыі 1943*. У вызваленні горада прымалі ўдзел партызаны 710-га і 15-га атрадаў, частка сіл партыз. палка «Трынаццаць». У 1959—62, 1965—66 Ч. у Крычаўскім, у 1962—65 у Краснапольскім р-нах. У 1970 — 5,4 тыс. ж. *В.В.Грынявецкі* (гісторыя).

Чэрыкаў. Вуліца Болдзіна.

ЧЭ́РЫКАЎ, геалагічнае агаленне, палеанталагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1963). Размешчана на левым схіле рова ў г. Чэрыкаў Магілёўскай вобл., на правабярэжжы р. Сож. На пл. 200 м^2 агаляюцца азёрна-балотныя адклады (гумусаваныя супескі і суглінкі, гітыя, торф) магутнасцю каля 4 м. Даследуецца з 1934. Выяўлена 85 відаў дрэў (граб, бук, ліпа, ясень, клён) і травяністых раслін (рагульнік, снітка, кальдэзія, сальвінія, бразенія, рдзест, плюшчай, шышняк і інш.), якія існавалі каля 100—70 тыс. г. назад. Геал. агаленне — апорны разрэз муравінскіх міжледавіковых і раннепаазерскіх адкладаў, мае вял. значэнне для вырашэння стратыграфічных і палеагеагр. пытанняў геал. мінулага Беларусі. *В.Ф.Вінакураў.*

ЧЭ́РЫКАЎСКІ ГІСТО́РЫКА-КРАЯЗНА́ЎЧЫ МУЗЕ́Й. Створаны 10.6.1983, адкрыты 27.11.1986 у г. *Чэрыкаў* Магілёўскай вобл. Пл. экспазіцыі 318 м^2, больш за 6,5 тыс. адзінак асн. фонду (2002). Мае раздзелы: стараж. перыяд, міжваен. перыяд (1915—41), Леменская школа-камуна, Вял. Айч. вайна, пасляваенны перыяд. Сярод экспанатаў зуб і поўсць маманта, жал. сякера 16 ст. з археал. помнікаў раёна, абразы канца 18 — пач. 19 ст., экспазіцыя «Сялянская хатка» з прадметамі побыту, прыладамі працы, нар. адзеннем, вырабамі ткацтва і вязання канца 19 — пач. 20 ст., калекцыя ручнікоў з вёсак раёна, у т.л. адселеных пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. У экспазіцыі Вял. Айч. вайны карта-схема абарончых баёў у 1941 на Чэрыкаўшчыне, матэрыялы пра дзейнасць падполля і партыз. рух, злачынствы ням. фашыстаў, макеты партыз. лагера і баёў партызан, матэрыялы пра землякоў Герояў Сав. Саюза. У раздзеле прыроды ўзоры карысных выкапняў, чучалы дзікіх птушак і жывёл Чэрыкаўшчыны. *В.М.Жураўлёва.*

ЧЭ́РЫКАЎСКІ ПАВЕ́Т, адм.-тэр. адзінка на Беларусі ў 1773—1924. Цэнтр — г. *Чэрыкаў*. Утвораны 13.8.1773 у складзе Рагачоўскай правінцыі, з 3.4.1777 у Магілёўскай, з 3.1.1797 — у Беларускай губ. У 1796 частка Ч.п. на Пд перададзена ў Рагачоўскі пав., на У да Ч.п. далучаны амаль увесь скасаваны Клімавіцкі пав. З 10.3.1802 у Магілёўскай губ. з аднаўленнем межаў 1777. Меліся 4 мястэчкі: Краснаполле (Маластоўка), Крычаў, Маляцічы, Студзянец. З 1861 падзяляўся на 16 валасцей: Беліцкую, Брацькавіцкую, Доўгавіцкую, Даўжанскую, Дубраўскую, Камаровіцкую, Крас-



Аўтар В.Л.Насевіч

напольскую, Крычаўскую, Лабанаўскую, Маляціцкую, Мхініцкую, Наваельненскую, Палужскую, Саматэвіцкую, Старынскую, Студзянецкую. Пл. 4084 кв. вярсты, каля 150,3 тыс. чал. (1897), з іх 135,3 тыс. праваслаўных, 1,7 тыс. каталікаў, 13 тыс. іудзеяў. З 26.4.1919 Ч.п. у складзе Гомельскай губ. РСФСР, 14.2.1923 да яго далучана Прапойская вол. скасаванага Быхаўскага пав. У выніку ўзбуйнення (1923) засталося 8 валасцей: Брацькавіцкая, Краснапольская, Крычаўская, Маляціцкая, Наваельненская, Прапойская, Саматэвіцкая, Чэрыкаўская. 3.3.1924 Ч.п. перададзены БССР, 2.6.1924 аб'яднаны з Клімавіцкім пав. пад назвай Калінінскі пав.

В.Л.Насевіч.

ЧЭРЫКАЎСКІ РАЁН. Размешчаны на У Магілёўскай вобл. Утвораны 17.7.1924, скасаваны 16.9.1959, адноўлены 30.7.1966. Пл. 1 тыс. км^2. Нас. 17,1 тыс. чал. (2003), гарадскога 49,7%. Сярэдняя шчыльн. 17 чал. на 1 км^2. Цэнтр — г. *Чэрыкаў*. Раён уключае 96 сельскіх нас. пунктаў, 5 сельсаветаў: Вепрынскі, Верамейкаўскі, Рэчыцкі, Сормаўскі, Язёрскі. Раён значна пацярпеў ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, уся яго тэр. забруджана радыенуклідамі, пераважна 1—15 Ku/км^2, на асобных участках да 40 Ku/км^2 і больш.

Тэр. раёна ў межах *Аршанска-Магілёўскай раўніны* і *Чачорскай раўніны*. Паверхня раўнінна-ўзгорыстая, на Пд — плоскія або дробнаўзгорыстыя ўчасткі; 57% яе на выш. 150—170 м, 30% ніжэй за 150 м і 13% вышэй за 170 м. Найвыш. пункт 189 м (каля в. Новая Беліца). Агульны нахіл паверхні з ПнУ на ПдЗ. Карысныя выкапні: мел, мергель, гліна цэментавая, буд. пяскі, гліны і суглінкі цагельныя, торф. Сярэдняя т-ра студз. -7,9 °С, ліп. 18,3 °С. Ападкаў 633 мм за год. Вегетац. перыяд 187 сут. Найб. р. Сож (перасякае раён з ПнУ на ПдЗ) з прытокамі Волчас з Яленкай, Вудага з Малой Вудажкай і Казлом, Лобчанка, Сянна з Рэктай і Домашняй. Азёры: Язёрскае, Галоўчыцкае, Рэчыцкае, Камароўскае. Глебы с.-г. угоддзяў: дзярнова-падзолістыя (54,4%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (25%), поймавыя (10,9%) і інш. Лясы займаюць 45,8% плошчы, пашыраны ўсюды, але найб. лясістасць на Пд. Пераважаюць хваёвыя, бярозавыя, яловыя, чорнальховыя, дубовыя лясы; трапляюцца ясянёвыя. Штучныя насаджэнні (16,4%) пераважна хваёвыя. Пад балотамі 1,9% тэрыторыі. На тэр. раёна помнікі прыроды рэсп. значэння: дуброва ў Вепрынскім лясніцтве, агаленне «Чэрыкаў» у г. Чэрыкаў.



Агульная плошча с.-г. угоддзяў 39 тыс. га, з іх асушаных 7,5 тыс. га. На 1.7.2003 у раёне 6 с.-г. вытв. кааператываў, 5 дзяржгасаў, 7 фермерскіх гаспадарак. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, конегадоўлі, вырошчванні збожжавых (жыта, пшаніца, трыцікале, ячмень, авёс), кармавых (кукуруза, караняплоды, аднагадовыя і шматгадовыя травы) і тэхн. (рапс) культур, бульбы. Прадпрыемствы прам-сці: харч. (цэльнамалочныя прадукты, сыр, казеін тэхн., плодаагародніннyя, таматныя і фруктовыя кансервы, мінер. вада «Сож» і інш.), каап. (хлебабулачныя, кандытарскія, каўбасныя і рыбныя вырабы, штучны мёд), дрэваапр. (піламатэрыялы); лясгас (драўніна, піламатэрыялы). На тэр. раёна праходзяць: чыгунка Магілёў—Крычаў, аўтадарогі Івацэвічы — граніца Рас. Федэрацыі, Магілёў—Чэрыкаў, Чэрыкаў—Краснаполле і інш. У раёне 9 сярэдніх (у т.л. 1 комплекс школа-сад), 1 базавая, 1 пач., 1 вячэрняя агульнаадук. школа, кулінарнае ПТВ, вучэбна-вытв. камбінат, цэнтр творчасці дзяцей і моладзі, цэнтралізаваная дзіцячая школа мастацтваў і 2 яе філіялы, спецыялізаваная дзіцяча-юнацкая школа алімп. рэзерву, дзіцячы дом змешанага тыпу «Пралеска», база юных турыстаў, 12 дашкольных устаноў, 19 клубаў і дамоў культуры, 16 б-к, 1 бальніца, 1 паліклініка, 2 амбулаторыі, 11 фельч.-ак. пунктаў. *Чэрыкаўскі гісторыка-краязнаўчы музей*, нар. краязнаўчы музей у сярэдняй школе в. Верамейкі. Помнікі архітэктуры: паркі ў в. Верамейкі (2-я пал. 19 ст.) і в. Юдаўка (пач. 20 ст.), паштовая станцыя (19 ст.) у в. Сакалоўка. Выдаецца газ. «Заклік Ільіча».

Літ.: Памяць: Гіст.-дак. хроніка Чэрыкаўскага р-на. Мн., 1994.

Р.Р.Паўлавец, Н.М.Трыфаненка.

ЧЭРЫТА (Cerrito) Фані (Франчэска; 11.5.1817, г. Неапаль, Італія — 6.5.1909), італьянская артыстка балета. Вучылася ў школе т-ра «Сан-Карла» ў Неапалі. У 1832—57 выступала ў т-рах Італіі, Вены, Лондана, а таксама ў Расіі. Рамант. танцоўшчыца. Яе выкананню ўласцівы паэт. адухоўленасць і паветранасць танца, віртуознасць, тэмперамент. Сярод партый: Ундзіна («Ундзіна» Ц.Пуні; сусв. вядомасць набыў яе «Танец з ценем»), Пакерэта («Пакерэта» Ф.Бенуа), сольныя партыі ў дывертысментах опер «Майсей» Дж.Расіні, «Густаў III, ці Баль-маскарад» Ф.Абера і інш. Выступала разам з М.*Тальёні*, Л.*Гран*, А.*Сен-Леонам*.

І.Л.Чэбан.

ЧЭСАПІКСКІ ЗАЛІЎ (Chesapeake Bay). У Атлантычным ак. каля берагоў ЗША. Даўж. каля 315 км, шыр. 5—30 км, глыб. да 27 м, на фарватэры — больш за 11 м. Прылівы паўсутачныя (каля 1 м). Гал. порт — Балтымар. Берагі заліва злучаны мастамі, у т.л. адным з найдаўжэйшых у свеце (19,5 км).

ЧЭ́СКЕ-БУ́ДЗЕЁВІЦЫ (České Budějovice), горад на ПдЗ Чэхіі, на р. Влтава. Засн. ў 1265. 97 тыс. ж. (1991). Трансп. вузел. Прам-сць: машынабудаванне, харчасмакавая (піваварны з-д «Будвар»), дрэваапр. (вытв-сць паперы, алоўкаў і інш.). Рэшткі замка (15 ст.), гатычныя дамы, манастыры і цэрквы (13—17 ст.), ратуша (18 ст.).

ЧЭСМЕ́НСКІ БОЙ 1770, марская бітва паміж рас. і тур. эскадрамі 7.7.1770 у бухце Чэсма (Чэшме) у Хіяскім праліве Эгейскага м. ў рус.-тур. вайну 1768—74 (гл. *Архіпелагскія экспедыцыі рускага флоту*). Рас. эскадра (9 лінкораў, 3 фрэгаты, 1 бамбардзірскі карабель) пад камандаваннем А.Р.*Арлова* (фактычна камандаваў адм. Р.А.Спірыдаў) 5 ліп. атакавала каля Чэсмы тур. флот (16 лінкораў, 6 фрэгатаў, 6 шэбек, 13 галер, 32 галіёты; каманд. капудан-паша Хасанбей) і патапіла флагманскі тур. карабель (разам з ім узарваўся рас. лінкор «Яўстафій»). Тур. караблі спешна адплылі ў Чэсменскую бухту, дзе былі заблакіраваны. Ноччу 7 ліп. да ўваходу ў бухту падышоў рас. авангард на чале з контрадм. С.К.Грэйгам (4 лінкоры, 2 фрэгаты, 1 бамбардзірскі карабель), уварваўся ў бухту і артыл. агнём знішчыў тур. флот (ацалелыя 1 лінкор і 5 галер трапілі ў палон). Туркі страцілі больш за 10 тыс. чал., расіяне — 11 чал. забітымі. У выніку гэтай перамогі рас. ВМФ запанаваў у Эгейскім м., а граф Арлоў атрымаў тытул Чэсменскага.

Літ.: Кулешов И.М., Печатина М.И., Хвощинская Л.З. Музей-памятник «Чесменская победа»: Путеводитель. Л., 1986; Доценко В.Д. Морские битвы России, XVIII—XX вв. СПб., 1999.

У.Я.Калаткоў.

ЧЭ́СТЭРТАН (Chesterton) Гілберт Кіт (29.5.1874, Лондан — 14.6.1936), англійскі пісьменнік; адзін з буйнейшых прадстаўнікоў *дэтэктыўнай літаратуры*. З 1900 супрацоўнічаў у перыяд. друку. Літ. дзейнасць пачаў як паэт (зб-кі «Гуляючыя старыя», «Дзікі рыцар», абодва 1900). У філас. рамане «Шар і крыж» (1909), зб-ках апавяданняў з займальнай інтрыгай пра сышчыка-свяшчэнніка Браўна (1911—35), зб. «Чалавек, які ведаў вельмі многа» (1922) дзіўнае, рамант., перайначанае жыццё, дзе традыцыйна ўсталяваныя адносіны з'яўляюцца фікцыяй, а свет вял. грошай і «высокай» палітыкі паўстае як цэнтр ілжывых прэтэнзій і дутых рэпутацый. У гумарыст. раманах «Напалеон з Нотынг-Хі-

ла» (1904), «Вяртанне Дон Кіхота» (1926) сац.-утапічныя матывы, звернутыя да сяродневякоўя. Аўтар фантаст. буфанады «Чалавек, які быў Чацвяргом» (1908), цыкла рэліг.-філас. эсэ «Артадоксія» (1908), паэм, літ.-крытычных прац, у т.л. пра творчасць Ч.Дзікенса, Б.Шоу.

Тв.: Рус. пер. — Рассказы. М., 1974; Писатель в газете: Худож. публицистика. М., 1984.

ЧЭ́ТНІКІ, 1) на Балканскім п-аве ў 15—19 ст. ўдзельнікі (гал. чынам гайдукі) узбр. нац.-вызв. барацьбы партыз. атрадаў (чэт) супраць асманскага ярма. 2) У 20 ст. ўдзельнікі велікасербскага руху і інш. груповак у Югаславіі. У гады 2-й сусв. вайны Ч. вялі барацьбу супраць нар.-вызв. сіл.

ЧЭХ, назва манеты наміналам у паўтара гроша (гл. *Паўтарак*) на Беларусі, Украіне і сумежных з імі тэр. Расіі ў 17—18 ст.

ЧЭХ (Čech) Сватаплук (21.2.1846, мяст. Остршадак каля г. Бенешаў, Чэхія — 23.2.1908), чэшскі пісьменнік. Скончыў Пражскі ун-т (1869). У 1878—99 заснавальнік і рэдактар час. «Květy» («Кветкі»). У зб-ках вершаў «Ранішнія песні» (1887), «Новыя песні» (1888), паэмах «Песні раба» (1894), «Касцы» (1903) асуджаў тагачасны лад, нац. і сац. прыгнёт, апяваў барацьбу працоўных супраць прыгнятальнікаў. Аўтар сатыр. аповесці «Падарожжа пана Броўчака ў XV стагоддзе» (1888), у якой філістэрству і беспрынцыповасці грамадства проціпаставіў гераічнае гусіцкае мінулае. Для яго твораў характэрны рамант. тэндэнцыі і рэалізм.

Тв.: Рус. пер. — Избранное. М., 1954.

Літ.: Кишкин Л.С. Сватоплук Чех: Очерк жизни и творчества. М., 1959; Чех Сватоплук: Биобиблиогр. указ. М., 1959.

ЧЭХАСЛАВА́КІЯ (Československo), дзяржава ў цэнтр. Еўропе ў 1918—92 на тэр. сучасных *Чэхіі* і *Славакіі*. Пл. 128 тыс. км^2, нас. (1986) 15,5 млн. чал., з якіх чэхаў 64%, славакаў 31%. Узнікла на чэш. і славацкіх землях *Аўстра-Венгрыі* ў выніку нац.-вызв. барацьбы чэхаў і славакаў, якая ўзмацнілася напярэдадні і ў час 1-й сусв. вайны. У 1915 чэш. паліт. дзеячы стварылі за мяжой Чэш. к-т дзеяння. Восенню 1915 заключаны дагавор паміж прадстаўнікамі Славацкай лігі і Чэш. нац. аб'яднання ў ЗША пра будучае аб'яднанне чэхаў і славакаў у федэратыўным саюзе дзяржаў. У маі 1916 пад кіраўніцтвам чэха Т.Г.*Масарыка* і славака М.Штэфаніка Чэш. к-т дзеяння пераўтвораны ў Чэхаславацкі нац. савет (ЧНС). Восенню 1916 прадстаўнікі чэш. партый стварылі Чэш. саюз у Вене і Нац. к-т у Празе. Летам 1918 урады краін *Антанты* прызналі ЧНС у якасці ўрада будучай дзяржавы чэхаў і славакаў. Нац. к-т у Празе 28.10.1918 абвясціў пра стварэнне незалежнай Ч. Гэтае рашэнне падтрымаў Славацкі нац. савет (у г. Марцін), які 30.10.1918 абвясціў пра аддзяленне Славакіі ад Венгрыі. 13.11.1918 зацверджана часовая канстытуцыя Чэхаславацкай Рэспублікі (першы прэзідэнт Масарык, першы прэм'ер-міністр К.Крамарж), межы якой вызначылі *Версальскі мірны дагавор 1919, Сен-Жэрменскі мірны дагавор 1919* і *Трыянонскі мірны дагавор 1920*. Акрамя чэш. і славацкіх зямель у яе склад увайшла населеная пераважна ўкраінцамі і венграмі Падкарпацкая Русь, на якую напачатку прэтэндавала і Венгрыя. Канфлікт з Польшчай з-за багатай вугалем Цешынскай Сілезіі вырашыўся ў 1920 падзелам яе паміж дзвюма дзяржавамі. У Ч. ў 1920 пражывала 13,5 млн. чал., у т.л. 7 млн. чэхаў, 2 млн. славакаў, 3 млн. немцаў. У складаных міжнар. умовах Славакіяй у студз. 1919 у Браціславе створана мін-ва па справах Славакіі з неабмежаванымі паўнамоцтвамі. На тэр. Ч. было сканцэнтравана амаль 70% прам-сці б. Аўстра-Венгрыі, што спрыяла хуткаму пераадольванню наступстваў вайны. Аднак эканам. развіццё розных частак Ч. было вельмі нераўнамернае. У адрозненне ад прамысл. развітай Чэхіі, Славакія заставалася пераважна с.-г. краінай са слабаразвітай прам-сцю, якая не вытрымлівала канкурэнцыі чэш. прадпрыемстваў і разаралася. Гэтая нераўнамернасць захоўвалася да канца існавання Ч. і, разам з нац.-культ. і нац.-паліт. фактарамі, згубна адбівалася на ўстойлівасці дзяржавы.

У лют. 1920 Часовы нац. сход прыняў канстытуцыю Ч., якая ўзаконіла ўжо сфарміраваную паліт. сістэму парламенцкай рэспублікі. Да сак. 1939 змянілася 20 урадаў, якія з 1922 узначальваліся ў асн. лідэрамі найб. шматлікай і ўплывовай у краіне Агр. партыі. Значным уплывам карысталіся таксама партыі: права-кансерватыўная Нац.-дэмакр., С.-д., Сацыяліст., Чэхаславацкая нар., Камуніст. (КПЧ, засн. ў 1921); у Славакіі найб. значнай была Хрысц. нар. партыя А.Глінкі. Ва ўмовах частай змены ўрадаў рэальная паліт. ўлада ў Ч. канцэнтравалася ў пазапарламенцкіх групоўках «Град», «Пяцёрка», «Васьмёрка», якія складаліся з лідэраў асн. паліт. партый. У 1920—30-я г. назіралася тэндэнцыя да ўзмацнення паўнамоцтваў прэзідэнта і ўрада. Масарыка, які памёр у 1935, змяніў на пасадзе прэзідэнта яго паплечнік па нац.-вызв. барацьбе Э.*Бенеш*. Прэм'ер-міністрам стаў аграрый М.Годжа. Да канца 1920-х г. у Ч. ў асн. завершана памяркоўная агр. рэформа, якая перадала сялянам за выкуп каля 150 тыс. га зямель буйных землеўладальнікаў (у іх засталося каля 40% зямельных угоддзяў краіны). Прам-сць у 1924—29 паспяхова развівалася, але эканам. крызіс пач. 1930-х г. прывёў да спаду вытв-сці на 40% і масавага беспрацоўя (1 млн. чал. у 1933). У 1937 аб'ём прамысл. вытв-сці толькі наблізіўся да дакрызіснага. У знешняй паліцыцы Ч. арыентавалася на ўмацаванне адносін з Францыяй, з якой у 1924 заключыла ваен.-паліт. саюз. У 1920—21 створаны ваен. саюз Ч. з Румыніяй і Югаславіяй — *Антанта малая*. *Лакарнскія дагаворы 1925* ускладнілі знешнепаліт. становішча Ч. У 1934 устаноўлены дыпламат. адносіны з СССР, у 1935 падпісаны дагавор аб узаемадапамозе. У сярэдзіне 1930-х г. ўзмацніўся ўплыў КПЧ і правых партый. Прагерм. Судэта-ням. партыя К.Генлейна патрабавала шырокай аўтаноміі для паўн. і паўн.-зах. раёнаў Ч., заселеных пераважна немцамі, скасавання дагавораў з СССР і Францыяй. Адначасова ўзмацніліся сепаратысцкія настроі ў Славакіі. Каб даць падставу для ўмяшання Германіі, генлейнаўцы ў ноч на 12 вер. 1938 арганізавалі ўзбр. мяцеж, які быў падаўлены. Аднак паводле навязаных Ч. Вялікабрытаніяй і Францыяй умоў *Мюнхенскага пагадненя 1938* Германія 1.10.1938 акупіравала Судэцкую вобл. і інш. пагранічныя раёны Ч. з пераважна ням. насельніцтвам. 2.10.1938 Польшча прымусіла Ч. аддаць ёй Цешынскую вобл. Паводле Венскага арбітражу 1938 Венгрыя 2.11.1938 захапіла паўд. раёны Славакіі і ч. Падкарпацкай Русі. У выніку Ч. страціла $^1/_3$ ч. сваёй тэр., 40% прам-сці, пагранічныя ўмацаванні і апынулася ў эканам. і паліт. залежнасці ад Германіі. Э.Бенеш пайшоў у адстаўку, прэзідэнтам выбраны Э.Гаха. Ён і ўрад т.зв. другой рэспублікі атрымалі права мяняць канстытуцыю. Па патрабаванні славацкіх і ўкр. паліт. дзеячаў былі створаны аўт. земскія ўрады Славакіі на чале з І.Цісам і Падкарпацкай Русі на чале з А.Бродзіем. У ходзе канфлікту з цэнтр. урадам славацкі сейм па ўказанні Германіі 14.3.1939 абвясціў «Незалежную Славацкую дзяржаву» на чале з прэзідэнтам Цісам. 15.3.1939 Гаха падпісаў у Берліне прапанаваны А.Гітлерам акт аб скасаванні «нежыццяздольнай» Ч. і ням.-фаш. войскі акупіравалі Чэхію і Маравію, дзе 16.3.1939 створаны т.зв. Пратэктарат Багемія і Маравія — нібыта аўт. ўтварэнне на чале з герм. імперскім пратэктарам К. фон Нейратам. Немцы пратэктарата абвяшчаліся герм. грамадзянамі. Падкарпацкую Русь захапіла Венгрыя. Пад кіраўніцтвам Бенеша ў 1939 у Парыжы створаны Чэхаславацкі нац. к-т (пазней ён пераехаў у Лондан, летам 1940 пераўтворацы ў Часовы ўрад Ч.). У эміграцыі створаны таксама Дзярж. савет Ч., які выконваў функцыі парламента. Бенеш прызнаны прэзідэнтам Ч. на эміграцыі. Урад СССР 18.7.1941 заключыў з чэхаславацкім эміграцкім урадам пагадненне аб ваен. супрацоўніцтве і 12.12.1943 дагавор аб дружбе, узаемадапамозе і пасляваен. супрацоўніцтве, якія прадугледжвалі аднаўленне Ч. ў дамюнхенскіх межах. На тэр. СССР з 1942 фарміраваліся чэхаславацкія вайск. часці, аб'яднаныя ў 1944 у армейскі корпус (камандзір — ген. Л.*Свобада*), які ўдзельнічаў у вызваленні Ч. У сак. 1945 у Маскве прадстаўнікі Бенеша дамовіліся з кіраўніц-

твам КПЧ і дэлегацыяй Славацкага нац. савета пра стварэнне Нац. фронту чэхаў і славакаў (НФ; увайшлі КПЧ, Кампартыя Славакіі, чэхаслаўацкія Нац.-сацыяліст., С.-д., славацкія Нар. і Дэмакр. партыі) і яго праграму. 4.4.1945 у вызваленым Чырв. Арміяй славацкім г. Кошыцы абвешчана аб стварэнні ўрада НФ і апублікавана праграма пасляваен. ўладкавання дзяржавы. Пасля поўнага вызвалення краіны ад ням. фашыстаў (май 1945) адноўлена Чэхаслаўацкая Рэспубліка. Паводле пагаднення паміж ёй і СССР ад 29.6.1945 Падкарпацкая Русь далучана да Укр. ССР. На аснове рашэнняў *Патсдамскай канферэнцыі 1945* ням. насельніцтва Ч. выселена ў Германію.

У адноўленай дзяржаве ролю парламента напачатку выконваў Часовы нац. сход (200 дэп. ад Чэхіі, 100 — ад Славакіі), кіруючай паліт. сілай быў НФ на чале з лідэрам КПЧ К.*Готвальдам*. Вял. паўнамоцтвамі карыстаўся прэзідэнт Бенеш (афіцыйна выбраны 19.6.1946). Адносіны цэнтр. і славацкіх дзярж. органаў рэгуляваліся спец. пагадненнямі, якія абмяжоўвалі паўнамоцтвы славацкага кіраўніцтва. На выбарах ва Устаноўчы сход (май 1946) камуністы атрымалі 114 дэпутацкіх месцаў з 300, новы ўрад узначаліў Готвальд. У 1945—47 праведзена агр. рэформа (канфіскаваны і перададзены ў прыватную ўласнасць сялянам землі немцаў, калабарацыяністаў і буйныя маёнткі), нацыяналізаваны горная, металургічная прам-сць, энергетыка, банкі. У лют. 1948 у знак нязгоды з курсам Готвальда на працяг нацыяналізацыі 12 міністраў з 26 падалі ў адстаўку. Аднак КПЧ арганізавала шматтысячныя маніфестацыі ў сваю падтрымку і стварыла рабочую міліцыю, якая паралізавала дзейнасць апазіцыйных партый. Бенеш быў вымушаны пагадзіцца на захаванне ўрада, адстаўку 12 міністраў і замену іх стаўленікамі Готвальда. Улада фактычна перайшла да КПЧ і яе прыхільнікаў у НФ. 9.5.1948 прынята новая канстытуцыя, якая абвясціла Ч. нар.-дэмакр. рэспублікай чэхаў і славакаў. На выбарах у Нац. сход 30.5.1948 НФ атрымаў 93% галасоў. Пасля адстаўкі Бенеша (7.6.1948) прэзідэнтам Ч. выбраны Готвальд (1948—53). У 1948 нацыяналізаваны прамысл. прадпрыемствы, у якіх працавала больш за 50 чал. (на прыватных прадпрыемствах засталося 5% работнікаў), канфіскаваны ўсе зямельныя ўладанні, большыя за 50 га. IX з'езд КПЧ (май 1949) прыняў генеральную лінію на пабудову ў Ч. асноў сацыялізму на сав. ўзор. Ч. ўступіла ў *Савет эканамічнай узаемадапамогі* (1949), падпісала *Варшаўскі дагавор 1955*. Працэс сацыяліст. перабудовы эканомікі і грамадства суправаджаўся паліт. рэпрэсіямі, якія працягваліся да сярэдзіны 1950-х г. і ахапілі каля 70 тыс. чал. (27 тыс. чал. загінулі); сярод рэпрэсіраваных старшыня аўтаномнага ўрада Славакіі Г.*Гусак* і Ген. сакратар ЦК КПЧ Р.Сланскі. Фармальна захоўвалася шматпартыйнасць (у рамках НФ), фактычна ж існавала дыктатура КПЧ. Пасля смерці Готвальда КПЧ у 1953—68 узначальваў яго прыхільнік А.*Новатны*; прэзідэнтам Ч. ў 1953—57 быў А.*Запатоцкі*, у 1957—68 — Новатны. У ліп. 1960 прынята новая канстытуцыя Ч., якая замацавала курс КПЧ на «пабудову камунізму», краіна стала наз. Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікай (ЧССР). У канцы 1960-х г. нарасталі крызісныя з'явы ў эканоміцы, абумоўленыя заганамі *адміністрацыйна-камандна-ай сістэмы*, абвастрылася нац. пытанне. У студз.-сак. 1968 Новатны адхілены ад пасад 1-га сакратара ЦК КПЧ і прэзідэнта краіны. Новае кіраўніцтва на чале з 1-м сакратаром ЦК КПЧ А.*Дубчакам* (1968—69) і прэзідэнтам ЧССР ген. Л.Свабадай (1968—75) спрабавала рэфармаваць эканоміку і грамадскае жыццё «зверху» ў дэмакр. духу (гл. «*Пражская вясна*»), аднак гэтаму перашкодзілі ўвод (жн. 1968) у Ч. войск СССР і інш. краін — членаў Варшаўскага дагавора, акрамя Румыніі, і інш. формы націску з боку кіраўніцтва КПСС. Рэфарматарскае кіраўніцтва КПЧ у 1969 адхілена, пад кіраўніцтвам Г.*Гусака* (з 1969 1-ы, з 1971 Ген. сакратар ЦК КПЧ, з 1975 адначасова прэзідэнт ЧССР) пачаўся працэс «нармалізацыі». Паводле канстытуцыйнага закона аб федэрацыі (27.10.1968) Ч. ператворана ў федэрацыю раўнапраўных і суверэнных сацыяліст. рэспублік — Чэшскай і Славацкай. Вышэйшым заканад. органам ЧССР стаў двухпалатны Федэральны сход, які складаўся з Нар. палаты (200 дэп.) і Палаты нацыянальнасцей (па 75 дэп. ад Чэхіі і Славакіі). Федэральны сход выбіраў прэзідэнта краіны. У канцы 1970-х г. на фоне эканам. цяжкасцей узніклі арг-цыі дысідэнтаў «Хартыя—77», «Камітэт абароны незаконна асуджаных» і інш. З пачаткам перабудовы ў СССР аналагічныя працэсы разгарнуліся і ў Ч., хоць кіраўніцтва КПЧ імкнулася замарудзіць іх. У 1987 Гусак заменены на пасадзе ген. сакратара ЦК КПЧ М.Якешам. З жн. 1988 адбываліся амаль няспынныя мітынгі і дэманстрацыі апазіцыі. У ходзе *«аксамітнай рэвалюцыі» 1989* КПЧ страціла манаполію на ўладу, сфарміраваны пераходны ўрад (камуністы, беспартыйныя, сацыялісты, прадстаўнікі нар. партыі) на чале з М.Чалфай. У снеж. 1989 Гусак пайшоў у адстаўку з пасады прэзідэнта, новым прэзідэнтам выбраны лідэр *Грамадзянскага форуму* В.*Гавел*, старшынёй Федэральнага сходу — А.Дубчак. У чэрв. 1990 адбыліся свабодныя выбары ў парламент, сфарміраваны ўрад з прыхільнікаў радыкальных рыначных рэформ. Восенню 1990 прыняты закон аб рэстытуцыях (вяртанні нацыяналізаванай маёмасці б. уладальнікам). Незадаволенасць славацкіх палітыкаў формай федэрацыі прывяла да яе рэфармавання законам ад 1.12.1990: б.ч. паўнамоцтваў перайшла ад федэральных органаў улады да рэсп., дзяржава пачала наз. Чэшскай і Славацкай Федэратыўнай Рэспублікай (ЧСФР). Эканам. цяжкасці і беспрацоўе ў пач. 1990-х г. абвастрылі супярэчнасці ў пытанні аб тэмпах і метадах эканам. рэформ паміж урадам Чэхіі і Славакіі. Вясной 1992 на парламенцкіх выбарах у Чэхіі перамагла правацэнтрысцкая кааліцыя прыхільнікаў радыкальных рэформ і захавання федэрацыі, у Славакіі — леваарыентаваны Рух за дэмакр. Славакію, які выступаў за поўны суверэнітэт Славакіі. Перагаворы паміж кіраўнікамі чэш. (В.*Клаўс*) і славацкага (У.*Мечыяр*) урадаў аб умовах захавання федэрацыі былі безвыніковымі. В.Гавел, пасля няўдалай спробы выбрання ў парламенце на новы тэрмін, 20.7.1992 падаў у адстаўку з пасады прэзідэнта ЧСФР. 25.11.1992 Федэральны сход прыняў закон, у адпаведнасці з якім ЧСФР 31.12.1992 спыніла існаванне, на яе тэр. ўтварыліся 2 незалежныя дзяржавы — Чэхія і Славакія.

Літ.: Краткая история Чехословакии. М., 1988; Коровицына Н.В. Агония соцмодернизации: Судьба двух поколений двух европейских наций. М., 1993. *Н.А.Царук.*

ЧЭХАСЛАВА́ЦКАГА КО́РПУСА МЯЦЕ́Ж 1918 у Расіі, антысавецкае выступленне Асобнага Чэхаславацкага корпуса (45 тыс. чал., сфарміраваны восенню 1917 з ваеннапалонных чэхаў і славакаў, якія раней служылі ў аўстравенг. арміі, для ўдзелу ў 1-й сусв. вайне). Паводле дамоўленасці з краінамі Антанты сав. ўрад у сак. 1918 пачаў перамяшчаць корпус (са студз. 1918 фармальна ў складзе франц. арміі) з Украіны на Д. Усход, каб ён мог праз г. Уладзівасток эвакуіравацца ў Зах. Еўропу. У маі 1918 эшалоны з чэш. і славацкімі вайскоўцамі расцягнуліся ад Паволжа да Уладзівастока. Незадаволеныя патрабаваннямі сав. ўрада здаць зброю і чуткамі пра паварот часткі эшалонаў на г. Архангельск чэхаславацкія часці ў маі 1918 арганізавана паўсталі пад заклікам «Праб'емся ва Уладзівасток сілай». Да вер. 1918 яны з дапамогай мясц. кадэтаў, эсэраў, меншавікоў, казакоў і інш. антыбальшавіцкіх сіл скінулі сав. ўладу на тэр. ад Паволжа да Уладзівастока, спрыялі ўтварэнню *Камітэта членаў Устаноўчага сходу*, «Часовага сібірскага ўрада», *Уфімскай дырэкторыі* і інш. Пасля шэрагу паражэнняў ад Чырв. Арміі восенню 1918 і захопу кіраўніцтва белым рухам манархістамі на чале з А.В.*Калчаком* (ліст. 1918) чэхаславацкія часці ў студз. 1919 зняты чэхаславацкім урадам з фронту і выконвалі ў тыле калчакаўскіх войск ахоўныя функцыі. Паводле дамоўленасці з урадам РСФСР ад 7.2.1920 Чэхаславацкі корпус да вер. 1920 пакінуў тэр. Расіі. *М.Г.Ніхіцін.*

ЧЭ́ХАЎ Антон Паўлавіч (29.1.1860, г. Таганрог, Расія — 15.7.1904), рускі пісьменнік. Скончыў Маскоўскі ун-т (1884). Ганаровы акад. Пецярбургскай АН (1900; у знак пратэсту супраць ад-

мены царом выбрання М.Горкага ганаровым акадэмікам разам з У.*Караленкам* у 1902 адмовіўся ад звання). Працаваў земскім урачом. Ездзіў на в-аў Сахалін (1890), дзе вывучаў жыццё катаржан і ссыльнапасяленцаў. З 1892 жыў у в. Меліхава пад Масквой, у 1899 па стане здароўя пераехаў у Ялту. Літ. творчасць пачынаў з фельетонаў і гумарыст. апавяданняў. Першае апавяданне — «Ліст да вучонага суседа» (1880), першыя зб-кі — «Казкі Мельпамены» (1884) і «Стракатыя апавяданні» (1886). У ранніх творах тэма «маленькага» чалавека, роздум над прыродай рабскай псіхалогіі («Смерць чыноўніка», «Тоўсты і тонкі», абодва 1883; «Хамелеон», 1884; «Унтэр Прышыбееў», 1885). Матывы драматызму, трагізму жыцця ўзмацніліся ў творах сярэдзіны 1880-х г. («Ванька», 1886, «Спаць хочацца», 1888, і інш.). У апавяданнях «Бабіна царства» (1894), «Мужыкі» (1897), «У яры» (1900) паказаў дзікунства і жорсткасць вясковага жыцця. У сталы перыяд творчасці глыбока аналізаваў уплыў сац. абставін на чалавечыя характары, тонка высвечваў душу чалавека, драматызм і трагізм змякчаў лірызмам і гумарам. Героі многіх яго твораў — самазадаволеныя абывацелі або змучаныя жыццём цёмныя людзі, даведзеныя да душэўнай тупасці («Чалавек у футарале», «Агрэст», «Іоныч», усе 1898). Вял. сілы сац.-псіхал. аналізу і маст. абагульнення дасягнуў у аповесцях «Стэп» (1888), «Палата №6» (1892), апавяданнях «Дама з сабачкам» (1899), «Архірэй» (1902) і інш. Апавяданні «Чорны манах», «Студэнт» (абодва 1894) пра таямнічую сувязь часоў і глыбіні падсвядомасці чалавека. Найвялікшы ўплыў на развіццё сусв. драматургіі зрабілі яго лірычна-псіхал. п'есы «Чайка» (паст. 1896), «Дзядзька Ваня» (паст. 1897), «Тры сястры» (паст. 1901, Грыбаедаўская прэмія), «Вішнёвы сад» (паст. 1904). Унёс новае ў разуменне трагічнага як звычайнага і будзённага, перанёс цэнтр цяжару з сюжэтнай інтрыгі на аналіз душы, на псіхал. сюжэт, спалучыў журбу, іронію і сарказм з лірыкай і сцішанай патэтыкай. Выключны ўплыў Ч. на сусв. л-ру 20 ст. адзначалі многія пісьменнікі свету. Творы Ч. часта перадрукоўваліся ў рус. газетах, што выходзілі на Беларусі («Минский листок», «Витебский голос» і інш.). Газ. «Северо-Западный край» публікавала матэрыялы, прысвечаныя творчасці Ч., «Голос провинции» падкрэсліваў сац.-выхаваўчыя функцыі яго твораў, «Гомельская мысль» прапагандавала літ. спадчыну пісьменніка. З рэцэнзіяй на кн. «Пісьмы А.П.Чэхава» выступіў М.Багдановіч (1916). Першы пераклад Ч. на бел. мову — вадэвіль «Сватанне» (пераклаў Н.Чарноцкі), выдадзены ў 1910 выд-вам «Загляне сонца і ў наша аконца»; у 1913 у гэтым выд-ве выйшаў вадэвіль «Мядзведзь». «Наша ніва» апублікавала пераклады апавяд. «Пера-апранутыя»,. «Мянтуз». На бел. мову творы Ч. перакладалі Я.Брыль, А.Васілевіч, І.Грамовіч, А.Звонак, В.Каваль, К.Крапіва, М.Лужанін, Я.Маўр, П.Пестрак, Я.Рамановіч, Т.Хадкевіч, І.Шамякін, В.Шашалевіч, А.Якімовіч і інш. Пра дабратворны ўплыў Ч. на іх творчасць сведчылі Я.Колас, М.Лынькоў, Брыль і інш. П'есы Ч. ставіліся і ставяцца на Беларусі. На прафес. і аматарскай сцэне да 1917 ішлі «Дзядзька Ваня», «Чайка», вадэвілі «Мядзведзь», «Сватанне», «Юбілей», інсцэніроўкі апавяданняў «Хірургія», «Зламыснік» і інш., паст. на рус. мове мясц. і заезджымі трупамі. «Сватанне» доўгія гады было ў рэпертуары трупы І.Буйніцкага. Творы Ч. ставілі т-ры Беларусі: «Ведзьма» БДТ (1923); «Мядзведзь» БДТ-1 (1933); «Дзядзька Ваня» Дзярж. рус. драм. т-р Беларусі (1949), Бел. т-р імя Я.Купалы (1965), Бел. т-р імя Я.Коласа (1996); «Вішнёвы сад» т-р імя Я.Купалы (1951), Нац. т-р імя Я.Коласа (1981, 2001), рус. драм. т-р (1981), Гродзенскі абл. драм. т-р (1982), Бел. дзярж. т-р лялек (2001, пад назвай «З Парыжам скончана!»); «Чайка» Нац. т-р імя Я.Купалы (1954; пад назвай «Больш, чым дождж», 2001), Брэсцкі абл. драм. т-р (1954), Бел. рэсп. т-р юнага гледача, Гродзенскі абл. драм. т-р (абодва 1977), Гомельскі абл. драм. т-р (1997); «Тры сястры» рус. драм. т-р (1944), т-р імя Я.Коласа (1951), Гродзенскі і Брэсцкі абл. драм. т-ры (абодва 1960), т-р імя Я.Купалы (1992); «Тры жарты» («Вядзьмарка», «Юбілей», «Прапанова») Брэсцкі абл. драм. т-р (1956); «Іванаў» Брэсцкі т-р драмы і музыкі (1996, пад назвай «Іванаў, Сара і Шурачка»), т-р «Дзе-Я?» (2000); «Драма на паляванні» Гродзенскі абл. драм. т-р (1963); «Каштанка» Бел. дзярж. т-р лялек (1941, 1952) і інш. Многія творы Ч. экранізаваны. Кінастудыя «Беларусьфільм» паст. фільмы «Мядзведзь» (1938), «Чалавек у футарале» (1939).

А.П.Чэхаў.

Тв.: Полн. собр. соч. и писем. Т. 1—30. М., 1974—83; Бел. пер. — Выбр. творы. Мн., 1937; Выбр. творы. Мн., 1946; Выбр. творы. Мн., 1954; Выбр. творы: Аповесці. Апавяданні. Камедыя. Мн., 1994; Смерць чыноўніка. Мн., 1930; Дзівакі-нябожчыкі. Мн., 1930; Дуэль; Іоныч. Мн., 1931; Спаць хочацца; Чалавек у футляры. Мн., 1936; Юбілей. Мн., 1936; Юмар. Мн., 1940; Каштанка. Мн., 1973.

Літ.: А.П.Чехов в воспоминаниях современников. М., 1960; Чуковский К.И. О Чехове. М., 1971; Лынькоў М.Ц. А.П.Чэхаў // Лынькоў М.Ц. Літаратура і жыццё. Мн., 1978; Брыль Я. Мой Чэхаў // Зб. тв. Мн., 1968. Т. 4; Бялый Г.А. Чехов и русский реализм. Л., 1981; Букчин С.В. Чехов в Белоруссии // Чехов и литература народов Советского Союза. Ереван, 1982; Линков В.Я. Художественный мир прозы А.П.Чехова. М., 1982; Кулешов В.И. Жизнь и творчество А.П.Чехова: Очерк. 2 изд. М., 1985; Катаев В.Б. Литературные связи Чехова. М., 1989; Чеховские чтения в Ялте. [Вып. 1—9]. М., 1973—97. *Г.С.Шупенька.*

ЧЭ́ХАЎ Міхаіл Аляксандравіч (28.8.1891, С.-Пецярбург — 30.9.1955), расійскі акцёр, рэжысёр, педагог. Засл. арт. Рэспублікі (1924). Пляменнік А.П.*Чэхава*. Скончыў Тэатр. школу А.Суворына ў Пецярбургу. Працаваў у т-ры Суворына. З 1913 акцёр Маскоўскага маст. т-ра, 1-й Студыі гэтага т-ра, пазней Маскоўскага маст. акад. т-ра 2-га (у 1924—27 маст. кіраўнік). З 1928 за мяжой (Германія, Латвія, Вялікабрытанія, ЗША): іграў у т-ры, здымаўся ў кіно, кіраваў тэатр. студыямі. Акцёр, надзелены вынаходлівасцю, абвостраным адчуваннем драматызму жыцця, схільны да экспрэсіяністычнага гратэску: Эрык XIV («Эрык XIV» А.Стрындберга), Гамлет, Мальволіо («Гамлет», «Дванаццатая ноч» У.Шэкспіра), Хлестакоў («Рэвізор» М.Гогаля), Аблявухаў («Пецярбург» А.Белага) і інш. Даследаваў праблемы акцёрскай псіхатэхнікі; пераасэнсаваўшы законы тэатр. творчасці, адкрытыя К.Станіслаўскім, распрацаваў «тэорыю імітацыі» (магчымасці поўнага пераўвасаблення акцёра). Аўтар. кн. «Шлях акцёра» (1928), «Пра тэхніку акцёра» (1953).

Літ.: Громов В. Михаил Чехов. М., 1970.

ЧЭХАЎЦЫ, радовішча жвірова-пясчанага матэрыялу ў Лідскім р-не Гродзенскай вобл., каля в. Чэхаўцы. Пластападобны паклад звязаны з міжмарэннымі водна-ледавіковымі адкладамі дняпроўска-сожскага гарызонту. Жвірова-пясчаны матэрыял буравата-жоўты, жаўтавата-шэры, з лінзамі і гнёздамі пяску, кандыцыйнага жвіру 15,4—40,9%. Пясок у сумесі розназярністы, палевашпатава-кварцавы, гліністы. Разведаныя запасы 6,7 млн. м^3, перспектыўныя — 1 млн. м^3. Магутнасць карыснай тоўшчы 2—11 м, ускрышы (торф, пясок, супесак) 0,2—4,7 м. Жвірова-пясчаны матэрыял прыдатны для вытв-сці бетону і дарожнага буд-ва. *А.П.Шчураў.*

ЧЭ́ХІ (саманазва ч э ш ы), народ, асноўнае насельніцтва Чэхіі (9,68 млн. чал., 2002). Жывуць таксама ў Канадзе (55 тыс. чал.), Славакіі (54,2 тыс. чал.), Германіі (27 тыс. чал.) і інш. Агульная колькасць 10,38 млн. чал. (1995). Гавораць на *чэшскай мове*. Вернікі — пераважна католікі, ёсць пратэстанты і праваслаўныя.

ЧЭ́ХІЯ (Čechy), Ч э ш с к а я Р э с п у б л і к а (Česká Republica), дзяржава ў Цэнтр. Еўропе. Мяжуе на Пн з Польшчай, на Пн і З з Германіяй, на Пд з Аўстрыяй, на У са Славакіяй. Пл. 78,7

тыс. км². Нас. 10 257 тыс. чал. (2002). Дзярж. мова — чэшская. Сталіца — г. *Прага*. Падзяляецца на 73 раёны і 4 муніцыпалітэты. Нац. свята — Дзень утварэння Чэхаславакіі (28 кастр.).

Дзяржаўны лад. Ч. — рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя, прынятая Нац. Саветам у снеж. 1992 (з папраўкай 1997). Кіраўнік дзяржавы — прэзідэнт, якога выбірае парламент на 5 гадоў. Заканад. ўлада належыць парламенту, які складаецца з 2 палат — палаты дэпутатаў і сената. Палата дэпутатаў (200 чал.) выбіраецца на 4 гады, а сенат (81 сенатар) — на 6 гадоў, пры гэтым $^1/_3$ яго складу абнаўляецца кожныя 2 гады. Вышэйшы выканаўчы орган — урад.

Прырода. Тэр. Ч. ўмоўна падзяляюць на 2 рэгіёны — *Багемію* (на З) і *Маравію* (на У). Зах. ч. займае *Чэшскі масіў*, які складаецца з раўнін, узгоркаў і плато. Яго акружаюць на ПнУ *Судэты* (хр. Крконашы, г. Снежка, 1602 м), на ПнЗ Рудныя горы, на ПдЗ Чэшскі Лес і Шумава, на ПдУ — Чэшска-Мараўскае ўзв. Карысныя выкапні: каменны і буры вугаль, каалін, графіт, мергель, вапнякі, поліметалы, рэдкія металы, вырабныя камяні, нафта і газ, крыніцы мінер. вод (Карлавы Вары, Марыянске-Лазне). Клімат умераны, пераходны ад марскога да кантынентальнага. Сярэднія т-ры студз. ад -2 да -4 °С на раўнінах і ад -7 да -8 °С у гарах, ліп. адпаведна ад 19—21 °С да 9—14 °С. Ападкаў ад 450—600 мм на раўнінах да 1200—1600 мм у гарах. Гал. рака Лаба з прытокам Влтава. На раўнінах пашыраны чарназёмы. на ўзгорыстых мясцовасцях — бурыя лясныя глебы, вышэй — падзолістыя і горна-лугавыя глебы. Пад лесам 34% тэр., пераважаюць хвойныя (елка, хвоя) і лісцевыя (дуб, бук) лясы. У складзе фауны буры мядзведзь, ліс, дзік, воўк, сарна; з птушак — фазан, курапатка, цецярук і інш. Крконашскі нац. парк.

Насельніцтва. 94,4% насельніцтва складаюць чэхі. Жывуць таксама славакі (3%), палякі (0,6%), немцы (0,5%), цыганы (0,3%), венгры (0,2%) і інш. Вернікі католікі (39,2%), пратэстанты (4,6%), праваслаўныя (3%) і інш. Сярэдняя шчыльн. 130 чал. на 1 км², найб. шчыльна заселены паўн. прамысл. раёны. У гарадах жыве 75% насельніцтва, каля палавіны — у малых гарадах (да 20 тыс. ж.). Найб. гарады (тыс. ж.): Прага — 1202 (2002), Брно — 390, Астрава — 326, Пльзень — 172 (1995). У прам-сці і буд-ве занята 40% эканамічна актыўнага насельніцтва, у сельскай гаспадарцы — 5%, у сферы паслуг і кіраванні — 55%.

Герб і сцяг Чэхіі.

Гісторыя. Тэр. Ч. заселена ў палеаліце. У 4—2 ст. да н.э. сюды прыйшлі кельцкія плямёны боіў (ад іх стараж. назва краіны *Багемія*), якіх у пач. 1-га тыс. н.э. выцеснілі герм. плямёны *маркаманаў*. У сярэдзіне 1-га тыс. яны перасяліліся ў Баварыю, а землі Ч. каланізавалі славяне (дзечаны, літамержыцы, пшаване, лемузы, злічаны, *дулебы*). Паводле падання, іх узначальваў правадыр Чэх (гл. *Лех, Чэх, Рус*) — легендарны заснавальнік Чэш. дзяржавы і будучага чэш. народа. З 7 ст. чэш. землі ў складзе паліт. аб'яднання кн. *Сама*, у 9 ст. — *Вялікамараўскай дзяржавы*. У Вял. Маравіі славяне ўпершыню былі далучаны да хрысціянства; тут прапаведавалі браты *Кірыла і Мяфодзій*, узнікла богаслужэнне на старасл. мове, што на доўгі час затрымала развіццё слав. (чэш.) культуры. У 895 ад Вялікамараўскай дзяржавы аддзяліліся чэш. землі, на якіх у 10 ст. ўтварылася стараж.-чэш. дзяржава (княства, з 1158 каралеўства) на чале з дынастыяй *Пржэмыславічаў* (правілі да 1306). У канцы 13 — 1-й пал. 14 ст. ў Ч. склалася феад.-саслоўная манархія. У пач. 14 ст. дзяржава Пржэмыславічаў, акрамя Ч. і Маравіі, аб'ядноўвала Аўстрыю, Карынтыю, Крайну, ч. Польшчы. У 1310—1437 чэш. землі ўваходзілі ў склад уладанняў дынастыі *Люксембургаў*, якія адначасова былі імператарамі «Свяшчэннай Рым. імперыі», герм. і чэш. каралямі. Росквіт сярэдневяковай Ч. звязаны з праўленнем Карэла I [1346—78, гл. *Карл IV*]. Пры ім яна заняла пануючае становішча ў імперыі, Прага стала яе сталіцай. *Залатая була* 1356 замацавала за чэш. каралямі правы курфюрстаў, што рабіла іх незалежнымі ад імперыі. Пры Карле IV засн. Пражскае архіепіскапства (1344) і *Пражскі універсітэт* (1348). У 2-й пал. 14 ст. эканоміка Ч. інтэнсіўна развівалася, хутка багацелі гарады Прага, Пльзень, Градзец, Усці і інш., у вёсцы знікла абшчына і сяляне пераводзіліся з паншчыны на аброк. Вял. ролю ў гасп. развіцці Ч. адыгрывала горназаводская прам-сць з цэнтрам у г. Кутна-Гора. Абвастрэнне сац. і нац. супярэчнасцей выклікала ў Ч. ў 1-й пал. 15 ст. нац.-вызв. антыкаталіцкі рух (гл. *Гус Я., Гусіцкія войны*). З 1526 Ч. ў складзе ўладанняў *Габсбургаў*, чыя палітыка цэнтралізацыі ўлады і германізацыі пазбаўляла яе паліт. і нац. суверэнітэту. У 1609 ва ўмовах пашырэння ў Ч. *лютэранства* дазволена свабода веравызнання, але ў 1620-я г. яна адменена, а каталіцкая царква адноўлена як пануючая. З 1627 Ч. кіравала з Вены спец. «Чэшская палата». У 1547, 1618—20, 1680, 1775 у Ч. адбыліся антыгабсбургскія паўстанні. Эканам. разарэнне Ч. ў час *Трыццацігадовай вайны 1618—48* выклікала т.зв. «другое выданне прыгонніцтва» (асабістая залежнасць сялян скасавана толькі ў 1781, феад. павінасці — у 1848). У канцы 18 — 1-й пал. 19 ст. ў Ч. разгарнуўся рух «будзіцеляў» (І.*Добраўскі*, Ф.*Палацкі*, Ф.Прохаска, І.Юнгман і інш.), якія змагаліся супраць ням. засілля, за захаванне і развіццё чэш. мовы і культуры. У час *рэвалюцыі 1848—49 у Аўстрыі* ў Ч. адбыліся выступленні супраць аўстр. абсалютызму (гл. *Пражскае паўстанне 1848*); пачалося фарміраванне нац. грамадскіх плыняў і паліт. партый. З 1867 Ч. ў складзе аўстр. часткі Аўстра-Венгрыі, была найб. эканам. развітой вобласцю з высокім узроўнем адукацыі насельніцтва (у пач. 20 ст. дасягнута ўсеагульная пісьменнасць). У 1905 уведзена ўсеагульнае выбарчае права. У 1-ю сусв. вайну, нягледзячы на ваен.-паліцэйскі рэжым, масавы характар набылі антыўрадавыя выступленні ў Ч., здача ў палон чэш. салдат і афіцэраў на фронце (з такіх палонных быў створаны чэхаславацкі корпус у рас. арміі).

Сумесная нац.-вызв. барацьба чэхаў і

славакаў, у т.л. намаганні дзеячаў чэш. і славацкай эміграцыі, якія арыентаваліся на краіны *Антанты* (Т.Г.*Масарык*, М.Штэфанік і інш.), зрабіла магчымым абвяшчэнне 28.10.1918 незалежнай Чэхаславацкай Рэспублікі (гл. *Чэхаславакія*). У яе складзе Ч. эканамічна і палітычна дамінавала над *Славакіяй*, якую пераўзыходзіла па тэр., насельніцтве (7 млн. чэхаў, 2 млн. славакаў), па прамысл. вытв-сці, бо сканцэнтравала ў сябе 70% прам-сці б. Аўстра-Венгрыі. У 1930-я г. ў Славакіі з'явіліся паліт. сілы, якія выступалі за яе аддзяленне ад Ч. У самой Ч. выспяваў нац. канфлікт паміж чэш. і ням. (3 млн. чал.) насельніцтвам, які ў 1938 скарыстала Германія для захопу чэш. зямель. Паводле *Мюнхенскага пагаднення 1938* Германія ў кастр. 1938 акупіравала Судэцкую вобл. і інш. землі Ч., пераважна населеныя немцамі. У сак. 1939 Германія справакавала абвяшчэнне Славакіяй «незалежнасці» і акупіравала астатнюю тэр. Ч., дзе быў створаны нібыта аўт. «Пратэктарат Багемія і Маравія» на чале з імперскім пратэктарам К. фон Нейратам, якому падпарадкоўваліся калабарацыянісцкі «аўтаномны ўрад» і «дзярж. прэзідэнт» Э.Гаха (б. прэзідэнт Чэхаславакіі). У Ч. разгарнуўся *рух Супраціўлення*, які актывізаваўся з пач. 2-й сусв. вайны, набываючы форму забастовак, сабатажу, маніфестацый пратэсту, пазней і партыз. барацьбы. Гітлераўцы жорстка распраўляліся з удзельнікамі Супраціўлення. У 1942 яны знішчылі разам з усім мужчынскім насельніцтвам шахцёрскі пасёлак *Лідзіцы*, жыхароў якога абвінавацілі ў дапамозе патрыётам, што забілі 2-га пратэктара «Багеміі і Маравіі» Р.*Гайдрыха*. У крас.—маі 1945 Ч. вызвалена сав. і амер. войскамі. Напярэдадні ўступлення Чырв. Арміі ў чэш. сталіцу адбылося *Пражскае паўстанне 1945*. З мая 1945 Ч. ў складзе адноўленай Чэхаславакіі, дзе ў лют. 1948 да ўлады прыйшла Камуніст. партыя Чэхаславакіі (КПЧ) і адбывалася будаўніцтва сацыялізму. Да канца 1980-х г., нягледзячы на заганы *адміністрацыйна-камандной сістэмы*, у Ч. значна вырас прамысл. патэнцыял, створана высокаэфектыўная калектыўная сельская гаспадарка (сяляне ў кааператывах захавалі свае «паі»). Паводле закона Чэхаславакіі ад 27.10.1968 Ч. і Славакія абвешчаны раўнапраўнымі і суверэннымі сацыяліст. рэспублікамі ў складзе чэхаславацкай федэрацыі. Вышэйшым органам дзярж. улады ў Ч. стаў Чэш. нац. савет (парламент), які выбіраўся насельніцтвам на 5 гадоў. Яго Прэзідыум прызначаў рэсп. ўрад. У выніку *«аксамітнай рэвалюцыі» 1989* улада ад камуністаў перайшла да прыхільнікаў дэмакратыі і рыначных рэформ на чале з лідэрам *Грамадзянскага форуму* В.*Гавелам*. Старыя і новыя эканам. і паліт. супярэчнасці паміж Чэхіяй і Славакіяй прывялі Чэхаславакію да распаду, у выніку якога 1.1.1993 утварылася незалежная Чэш. Рэспубліка. Яе прэзідэнтам у 1993 — пач. 2003 быў Гавел. У 1993—98 краінай кіравалі ўрады партый правацэнтрысцкай кааліцыі (прэм'ер-міністры В.*Клаўс*, І.Ташаўскі), з 1998 — левацэнтрысцкай кааліцыі (прэм'ер-міністры М.Земан і з 2002 — У.Шпідла). У сак. 2003 прэзідэнтам Ч. выбраны В.Клаўс. У 1990-я г. ў Ч. паслядоўна праводзілася палітыка эканам. рэформ, найперш па прыватызацыі і дэнацыяналізацыі дзярж. маёмасці і стварэнні канкурэнтнага асяроддзя. У знешняй палітыцы Ч. арыентуецца на краіны Зах. Еўропы і ЗША. Ч. — чл. ААН (з 1993), Савета Еўропы (з 1993), НАТО (з 1999), інш. міжнар. арг-цый. Дыпламат. адносіны з Рэспублікай Беларусь устаноўлены 5.1.1993.

Палітычныя партыі і прафсаюзы: Чэш. с.-д. партыя, Грамадз. дэмакр. партыя, Камуніст. партыя Чэхіі і Маравіі, Хрысц.-дэмакр. унія — Чэхаславацкая нар. партыя, Саюз свабоды. Асн. прафс. аб'яднанне — Чэшска-мараўская канфедэрацыя прафсаюзаў.

Гаспадарка. Ч. — індустр.-агр. краіна. З 1990 ажыццяўляюцца пераўтварэнні з мэтай выхаду на параметры рыначнай эканомікі: спынены спад вытв-сці, праведзены рэформы цэн і гандлю, практычна завершана прыватызацыя, адбылася структурная перабудова і інш. Станоўчыя зрухі ў эканоміцы пачаліся з 1994 з ростам прамысл. вытв-сці, буд-ва, турызму і інш. сектараў сферы паслуг, у т.л. банкаўскага і фінансавага. Паліт. стабільнасць і паслядоўная эканам. палітыка стварылі добры інвестыцыйны клімат для замежнага бізнесу. За 1989—2000 аб'ём прамых інвестыцый склаў 21,4 млрд. долараў. Валавы ўнутр. прадукт (ВУП) у 2000 132,4 млрд. дол., каля 12,9 тыс. дол. на чалавека. У прам-сці ствараецца 41,7% ВУП, у сельскай гас-

Да арт. **Чэхія**. Карлавы Вары зімой.

Да арт. **Чэхія**. Чэшска-Мараўскае ўзвышша.

падарцы — 4,6%, у сферы паслуг — 53,7%. Прамысловасць — важная частка гасп. комплексу. Чэшскія прамысл. вырабы традыцыйна адметныя высокай якасцю, што звязана са шматвяковымі звычкамі і наяўнасцю кваліфікаваных кадраў. У эканоміцы вылучаюцца буйны індустр. вузел — раён гарадоў Прага, Пльзень і Астраўска-Карвінскі кам.-вуг. бас. — з цяжкай прам-сцю і паласа паміж гарадамі Градзец-Кралаве і Лібераць з пераважай тэкст. і шкляной прам-сці. Паліўна-энергет. комплекс краіны грунтуецца на мясц. вугалі (на 90%), імпартуемых з Расіі і часткова здабываемых (каля г. Годанін) нафце і газе. Штогадовая здабыча вугалю 117—120 млн. т. Буры вугаль (3/4 здабычы) распрацоўваецца адкрытым спосабам (Масцецкі і Сокалаўскі бас.), каменны і каксоўны — у Астраўска-Карвінскім бас. Вытв-сць электраэнергіі 69,6 млрд. кВт·гадз (1999) на ЦЭС (75,5%; размешчаны ў

раёнах здабычы бурага вугалю), ГЭС (2,6%; каскады на р. Влтава), АЭС (20,4%; на Пд Маравіі) і інш. Чорная металургія забяспечана мясц. каксоўным вугалем, невял. колькасцю жал. руды (здабыча ў раёне гарадоў Прага—Пльзень). Асн. частка жал. руды паступае з Расіі і Украіны. Буйныя металург. прадпрыемствы ў Кунчыцах і Віткавіцах (каля Остравы), Тршынец, Кладна, Пльзень, Хомутаў. Штогод выплаўляецца больш за 7 млн. т сталі і 5 млн. т чыгуну (60% у Астраўскім р-не). Здабыча свінцова-цынкавых (Кутна-Гора), уранавых (Паўн. Багемія) руд, золата, волава, графіту, кааліну. Гал. галіна прам-сці — машынабудаванне. Развіта цяжкае (вытв-сць комплекснага абсталявання для энергет., металургічнай і хім. прам-сці), трансп. (аўтамабілі, электравозы, трамваі) і электроннае машынабудаванне. Ваен.-прамысл. комплекс спецыялізуецца на вытв-сці камп'ютэраў, радыё і тэлеф. сістэм, крыпталагічнага абсталявання, радараў і інш. Гал. маш.-буд. цэнтры: Прага, Брно, Пльзень, Ліберац, Млада-Болеслаў, Копршыўніцы. Хуткімі тэмпамі развіваецца хім. прам-сць. За 1992—96 аб'ём інвестыцый у яе склаў 2 млрд. дол. (у машынабудаванне — 1,3 млрд. дол.). Вытв-сць валокнаў, пластмас, сінт. смалы і каўчуку ў гарадах Кралупі-над-Влтаваў, Усці, Острава, Мост і інш. Галіна пастаўляе на сусв. рынак мінер. ўгнаенні, пестыцыды, сыравіну для фармацэўтычнай прам-сці.

Лёгкая прам-сць — адна з галін міжнар. спецыялізацыі Ч. Вытв-сць баваўняных і шаўковых (Нахад, Трутнаў), шарсцяных (Брно), ільняных (Ліберац) тканін, абутку (32 млн. пар, Злін), швейных вырабаў. Вял. значэнне для краіны маюць шкларобная (Паўн. Ч.) і фарфоравая (Карлавы Вары, Цепліцы) прам-сць, якія працуюць на мясц. шкловых пясках і кааліне. У г. Ябланец вырабляюць вядомую чэшскую біжутэрыю — ювелірныя вырабы са шкла і паўкаштоўных камянёў. Традыц. галіна харч. прам-сці — піваварная (Пльзень, Прага, Брно, Чэске-Будзеёвіцы) і цукр. (Маравія, Палаб'е). Вытв-сць піва каля 1800 млн. л, цукру — 560 тыс. т штогод. Развіта лясная, цэлюлозна-папяровая і мэблевая прам-сць; вытв-сць буд. матэрыялаў. Сельская гаспадарка Ч. забяспечвае большую ч. патрэбы краіны ў харч. прадуктах, часткі с.-г. прадукцыі экспартуецца. У выніку рэформ праведзена рэстытуцыя (аднаўленне) правоў на зямлю. Больш за $^3/_4$ с.-г. кааператываў пераўтвораны ў кааператывы зямельных уласнікаў, на 50% скараціласа колькасць занятых. С.-г. ўгоддзі займаюць 4250 тыс. га, у т.л. ворныя землі 3227 тыс. га, сенажаці 157 тыс. га, паша 866 тыс. га. Каля палавіны пасяўной пл. — пад збожжавымі культурамі, пераважна пшаніцай (штогадовы збор каля 4 млн. т). Вырошчваюць таксама ячмень, жыта, авёс, кукурузу, цукр. буракі, лён, канаплі, хмель, люцэрну, канюшыну. Бульбаводства і агародніцтва. Садоўніцтва і вінаградарства. Развіта жывёлагадоўля ($^1/_2$ валавой і $^2/_3$ таварнай прадукцыі). Пагалоўе (млн. галоў, 2001): буйн. раг. жывёлы — 1,58, свіней — 3,59, авечак — 0,09, коз — 0,03, птушак — 14,69. Рыбалоўства. Улоў рыбы ў 1999 склаў 20,9 тыс. т. Даўж. чыгунак 9435 км, аўтадарог 127 693 км (усе з цвёрдым пакрыц-

Да арт. **Чэхія**. Панарама Прагі.

Да арт. **Чэхія**. Удзельнікі антыфашысцкага паўстання ў Празе. Май 1945.

цём), у т.л. першакласных аўтамагістралей (хайвэі) — 498 км. У краіне 4,41 млн. легкавых і 0,5 млн. грузавых аўтамашын. Суднаходства па р. Лаба. Рачныя парты — Прага, Усці, Дэчын. 43 аэрапорты, у т.л. міжнар. аэрапорт Рузіне (Прага). У 2000 экспарт склаў 28,3 млрд. дол., імпарт 31,4 млрд. дол. У экспарце пераважаюць машыны і абсталяванне, хімікаты, кокс, пракат, тэкстыль, абутак, шкляныя і фарфоравыя вырабы, цукар, піва, солад, хмель і інш., у імпарце — мінер. сыравіна, паліва, паўфабрыкаты для цяжкай індустрыі і інш. Асн. гандл. партнёры: Германія (43% экспарту і 37% імпарту), Славакія (8,4% і 6,7%), Аўстрыя, Францыя, Расія. Гандлёвы абарот Беларусі з Ч. ў 2001 склаў 92,6 млн. дол., у т.л. экспарт 35,4 млн. дол., імпарт 57,2 млн. дол. Ч. — краіна развітога турызму. Штогод краіну наведвае больш за 10 млн. турыстаў, даход ад турызму ў 2000 склаў 3,04 млрд. дол. Грашовая адзінка — чэшская крона.

Узброеныя сілы (2002). Уключаюць рэгулярныя ўзбр. сілы (49,45 тыс. чал.),

ваенізаваныя фарміраванні (5,6 тыс. чал., у т.л. 4 тыс. чал. у пагран. войсках і 1,6 тыс. чал. — сілы ўнутр. бяспекі). Вярх. галоўнакамандуючы — прэзідэнт. Камплектаванне паводле прызыву. Рэгулярныя ўзбр. сілы складаюцца з сухап. войск, ВПС і ППА. У сухап. войсках 36,37 тыс. чал., 622 танкі, 879 баявых машын пяхоты, 923 бронетранспарцёры, 182 браніраваныя разведвальна-дазорныя машыны, 298 самаходных гармат, 109 рэактыўных сістэм залпавага агню, каля 140 зенітных ракетных комплексаў і інш. У ВПС і ППА 11,3 тыс. чал., 75 баявых самалётаў, 34 баявыя верталёты і інш.

Ахова здароўя. Сістэма аховы здароўя ўключае мед. страхаванне, таксама развіта прыватная медыцына (прыватызавана 76% аптэк, 95% паліклінік, 1996). Сярэдняя працягласць жыцця мужчын 71,5, жанчын 78,7 гадоў (2002). Узровень нараджальнасці — 9,1 на 1 тыс. чал., смяротнасць 10,8 на 1 тыс. чалавек. Натуральны прырост адмоўны: -0,17%. Забеспячэнне бальнічнымі ложкамі — 1 на 146 чал., урачамі — 1 на 259 чал. (1997). Дзіцячая смяротнасць 5,5 на 1 тыс. нованароджаных. Курорты: *Карлавы Вары*, *Марыянске-Лазне*, *Франціškаві-Лазне*.

Асвета, навуковыя ўстановы. Сістэма адукацыі ўключае дашкольныя ўстановы (для дзяцей 3—6 гадоў), агульнаадук. і прафес. школы, сярэднія спец. і вышэйшыя навуч. ўстановы. На ўсіх узроўнях адукацыі існуюць дзярж. і прыватныя навуч. ўстановы. Дзеці 6—10 гадоў вучацца ў пачатковай асн. школе. Далей адукацыю працягваюць у гімназіях (да 19 гадоў) ці сярэдніх школах (да 16 гадоў). Большасць выпускнікоў сярэдніх школ працягвае адукацыю ў каледжах ці сярэдніх прафес. школах, дзе набывае спецыяльнасць. У сістэме вышэйшай адукацыі ун-ты, ін-ты і акадэміі. У адпаведнасці з Законам аб вышэйшай адукацыі ад 1.1.1999 ун-тамі маюць права называцца ВНУ, якія рыхтуюць кандыдатаў і дактароў навук, акадэміямі — ВНУ, якія даюць вышэйшую адукацыю ў галіне л-ры, культуры і мастацтва. Навучанне ў дзярж. ВНУ бясплатнае. З 1.1.1999 замежныя грамадзяне таксама могуць бясплатна атрымліваць адукацыю ў Ч., калі яны валодаюць чэш. мовай. Дзярж. ВНУ рыхтуюць бакалаўраў (3 гады навучання) і магістраў (5 гадоў навучання). Усе камерцыйныя ВНУ (створаны ў 1990-я — пач. 2000-х г.) рыхтуюць студэнтаў толькі да ўзроўню бакалаўраў. Гэтыя ВНУ праходзяць у Мін-ве адукацыі Ч. абавязковую атэстацыю на якасць навучання. Сістэма адукацыі ў Ч. адпавядае патрабаванням еўрап. і міжнар. стандартаў адукацыі. У Ч. 37 ВНУ. Найбуйнейшыя з іх: *Пражскі універсітэт* (з 1348, каля 37 тыс. студэнтаў), ун-ты Масарыка ў Брно (з 1919, 17 тыс.), імя Ф.Палацкага ў Оламаўцы (з 1566, 11 тыс.), тэхнічныя ў Празе, Остраве і Брно, эканамічны ў Празе, земляробчы ў Брно і інш. Найбуйнейшыя б-кі: Нацыянальная Ч., АН, Дзярж. тэхнічная, Дзярж. медыцынская ў Празе, Дзярж. навук. ў г. Чэске-Будзеёвіцы і інш. Музеі: Нац. галерэя, Нац., Пражскі гарадскі, зброі, этнагр., гісторыка-археал., маст. рамёстваў, тэхнічны і інш. Навук. даследаванні вядуцца ў Чэшскай АН, н.-д. ін-тах, ва ун-тах.

Да арт. **Чэхія**. Бітва паміж гусітамі (злева) і нямецкімі крыжакамі ў час гусіцкіх войнаў 1419—34.

Да арт. **Чэхія**. Будучы прэзідэнт Чэхаславакіі і Чэхіі В.Гавел на мітынгу апазіцыі ў час «аксамітнай рэвалюцыі» 1989.

Да арт. **Чэхія**. Сабор святой Барбары ў г. Кутна-Гора.

Друк, радыё, тэлебачанне. У 2002 у Ч. выдавалася больш за 60 штодзённых газет і інш. перыяд. выданняў. Найб. тыражныя газеты: «Mladá fronta dnes» («Маладзёжны фронт сёння», з 1945), «Právo» («Права», з 1991), «Lidove noviny» («Народная газета», з 1893), «Hospodářské noviny» («Эканамічная газета», з 1957), «Zemědělské noviny» («Сельскагаспадарчая газета», з 1945), «Práce» («Праца», з 1945), «Sport» («Спорт», з 1953). Інфарм. агенцтва — Чэш. тэлегр. агенцтва (ЧТК, з 1992). Радыёвяшчанне з 1923. Вяшчаюць 3 агульнанац. і 82 рэгіянальныя і мясц. радыёстанцыі. Грамадская радыёстанцыя «Чэшскае радыё» мае 4 агульнанац. і 1 рэгіянальную праграмы. Тэлебачанне з 1953. Вяшчанне вядуць 3 тэлекампаніі — грамадская «Чэшскае тэлебачанне» (2 праграмы), прыватныя «Нова ТВ» і «Прыма ТВ». Дзейнічаюць 37 рэгіянальных і мясц. тэлекампаній. Ліцэнзаванне і нагляд за дзейнасцю радыёстанцый і тэлекампаній ажыццяўляе Чэш. савет па радыёвяшчанні і тэлевізійным вяшчанні (з 1992).

Літаратура. Развіваецца на *чэшскай мове*. З'яўленню першых твораў чэш. пісьменнасці (духоўныя песні, жыціі, паданні на стараслав. мове) спрыяла асветніцкая дзейнасць Кірылы і Мяфодзія (9—10 ст.). З 11 ст. пісьмовай мовай стала латынь; найб. значны твор — «Чэшская хроніка» Казьмы Пражскага (1125). У канцы 13 ст. ўзніклі вершаваныя творы на чэш. мове («Александраіда», «Далімілава хроніка»). Росквіту чэш. л-ры спрыялі ідэі Адраджэння, адкрыццё Пражскага ун-та (1348). Развіваліся свецкія жанры — рыцарскі раман, нар. драма, любоўная лірыка, ваганцкія сатыр. песні. Першы вядомы чэш. пісьменнік — Т.Шціны. У 15 ст. развіццё л-ры звязана з гусіцкім рухам (публіцыст. і філас. творы *Я.Гуса*, *Я.Жыжкі*, П.Хельчыцкага). У 1468 у Ч. пачалося кнігадрукаванне: Мікулаш Конач з Годзішкава, Даніэль Адам з Веслеславіна. У л-ры канца 15—16 ст. выявіліся гуманіст. тэндэнцыі (творы В.Корнеля з Ушэграда, В.Гаека з Лібачан). Страта Ч. незалежнасці пасля бітвы каля Белай Гары (1620) і засілле ням.-каталіцкай рэакцыі адмоўна адбіліся на развіцці чэш. л-ры ў 17—18 ст. У эміграцыі працаваў педагог-гуманіст *Я.А.Каменскі*. Эпоха нац. адраджэння (канец 18 — 1-я пал. 19 ст.) характарызавалася ўздымам вызв. руху, фарміраваннем нацыі і нац. культуры, асветніцкай дзейнасцю дэмакр. інтэлігенцыі (вучоныя *П.І.Шафарык*, *І.Добраўскі*, Ф.Палацкі, І.Юнгман, паэты *Я.Колар*, А.Пухмаер, Ф.Л.Чэлакаўскі і інш.). У 1830-я г. ўзнік рамантызм (*К.Г.Маха*,

К.Я.Эрбен), развівалася драматургія (І.К.Тыл). У 2-й пал. 19 ст. ў чэш. л-ры ўсталяваліся рэаліст. тэндэнцыі (публіцыстыка К.*Сабіны*, паэзія *Я.Врхліцкага*, С.*Чэха*, І.В.Сладака, проза Б.*Немцавай*, сатыр. творы К.Гаўлічка-Бораўскага). Серыю гіст. раманаў стварыў А.*Ірасек*, з літ.-крытычнымі артыкуламі выступіў *Я.Неруда*. Рэалістычна адлюстроўвалі жыццё Я.Арбес, В.Галек, В.Мрштык, А.Сташак. На мяжы 19—20 ст. у л-ры пашырыліся мадэрнісцкія і дэкадэнцкія тэндэнцыі (І.С.*Махар*, С.К.*Нейман*, О.Бржэзіна, А.Сова, Ф.Шрамек). Пратэстам супраць тагачаснага ладу прасякнута паэзія Ф.Гельнера, К.Томана. Праблемы 1-й сусв. вайны адлюстроўвала т.зв. легіянерская проза (Р.Медак). У літ. крытыцы выступілі О.Госцінскі, Т.Г.*Масарык*, Ф.К.Шальда і інш. З утварэннем Чэхаславацкай рэспублікі ўзнікла т-ва маладых мастакоў і паэтаў «Дзеветсіл», зарадзілася пралет. паэзія (І.*Гора*, В.*Незвал*, *Я.Сейферт*, К.Бібл, І.Волькер, Нейман). Развівалася проза — сац. І.*Ольбрахта*, М.*Пуйманавай*, У.Ванчуры, М.Маеравай, сатыр. *Я.Гашака*, філас. Л.Клімы, фантаст. К.*Чапека*, псіхал. Э.Гостаўскага. Сусв. вядомасць набылі структуралісцкія працы *Я.Мукаржаўскага*. У 2-ю сусв. вайну ў фаш. засценках загінулі Ю.*Фучык*, Ванчура і інш. У пасляваен. гады дэбютавалі В.*Гавел*, П.*Когаўт*, М.*Кундзера*, Б.Грабал. Развівалася паэзія І.*Коларжа*, У.Голана, М.Голуба, Ф.Грубіна, Я.Заграднічка, проза Я.Вейла, Я.Дрды, М.Кратахвіла, А.Луціга, Л.Фукса і інш. 2-я пал. 20 ст. адметная росквітам гіст. рамана (В.Капліцкі, У.Неф, Б.Ржыга, І.Томан і інш.). Узніклі т.зв. праблемная, або канфрантацыйная, проза (Б.Бржэзаўскі, А.Клімент), метафарычны, эксперым. раман (У.Клевіс, В.Лінгартава, Э.Мандлер, В.Сладкава). Узмацненне сувязі з еўрап. л-рамі прадвызначыла развіццё рамана сац. (Я.Отчанашак, В.Ржэзач), філас. рамана-міфа (Чапек), неарамана (А.Востра, І.Фрыед), экзістэнцыяльнага (У.Кёрнер), постмадэрнісцкага (М.Вівег, Грабал), навук.-фантаст. (Я.Вейс, І.Несвадба, Л.Соўчак), гумарыст. (М.Горнічак, М.Капек), «пра вайну» (К.І.Бенеш, Э.Ф.Бурыян, Гашак, Дрда, Чапек, І.Шкворацкі) і інш. У 1990-я г. чэш. л-ру прадстаўлялі празаікі І.Груша, Я.Топаль, М.Тршэшцік, О.Філіп, паэты М.Айваз, І.Рульф, І.Шыман, драматургі К.Стэйгервальд, Д.Фішэр.

Да арт. **Чэхія**. Замак Карлштэйн.

Да арт. **Чэхія**. «Дом, які танцуе» ў Новым горадзе Прагі.

Да арт. **Чэхія**. Тройскі замак з французскім садам у Празе.

На бел. мове выдадзены «Чэшскія і славацкія апавяданні» (1958), зб. чэш. нар. казак «Кубачак, вары!» (1977), анталогія сучаснай чэш. паэзіі «Высокае неба» (1980), творы Гашака («Цвёрдая скура», 1931; «Прыгоды ўдалага ваякі Швейка ў сусветную вайну», ч. 1—3, 1931—32; «Госць у хату», 1984), Гашака і К.Ванака («Прыгоды ўдалага ваякі Швейка», ч. 4, 1932), Ванака («Прыгоды ўдалага ваякі Швейка», ч. 5—6, 1931—32), Ольбрахта («Ганна-пралетарка», 1932), Фучыка («Слова перад пакараннем смерцю», 1953), Дрды («Нямая барыкада», 1955), І.Марака («Маладыя змагары», 1958), П.Бояра і В.Бояравай («Закаханыя», 1960), Ржыгі («Паездка Гонзіка ў вёску», 1961), І.Кубічка («Люцынка», 1965), Чапека («Казкі і вясёлыя гісторыі», 1966, 1997), Ірасека («Скалакі», 1974), Б.Ногейла («Паводка»), В.Стыблавай («Мой брацік», абодва 1977), Я.Козака («Гняздо бусла», 1979), М.Стынгла («Украдзены татэм», 1981), І.Герцыкавай («Цень сну», 1985), Незвала («Васількі і гарады», 1986), Гавела («Свята ў садзе», 1995; «Аўдыенцыя», 1997), І.Скалы («Вітаю вас, вокны!», 1995), С.Рудольфа («Маё дзіўнае вужа»), Э.Баса («Клапзубава каманда», абодва 1998). Сярод перакладчыкаў на бел. мову Л.Баршчэўскі, Я.Васілёнак, У.Дамашэвіч, Х.Жычка, М.Кенька, В.Крайко, А.Мажэйка, П.Макаль, П.Марціновіч, С.Міхальчук, М.Татур, І.Шаблоўская, Г.Шчарбатаў і інш.

Архітэктура. Рэшткі ўмацаваных паселішчаў 9 ст. выяўлены ў Празе і ў Паўд. Маравіі; найб. значнае з іх «На валах» у с. Мікульчыцы — з драўлянымі і каменнымі ўмацаваннямі і дамамі, храмамі ў познаант., візант. і познакаралінгскіх традыцыях (храм-ратонда св. Віта ў Празе, каля 935). У 11—13 ст. склаўся раманскі стыль: базілікі св. Віта і св. Іржы ў Пражскім Градзе, рэшткі крэпасці Пржэмыславічаў у Оламаўцы; кляштары і замкі (Пражскі Град, Кршываклат, Чэскі-Крумлаў і інш.), каля якіх узніклі гар. паселішчы з каменнымі дамамі, умацаваннямі, мастамі. Росквіт сярэдневяковай архітэктуры звязаны з готыкай 13—15 ст. Для пабудоў характэрны велічнасць форм, стрыманасць урачыстага канструктыўна выразнага дэкору: усх. ч. сабора св. Віта [арх. Мацвей з Араса і П.Парлерж (гл. *Парлер*)], ратуша ў Старым горадзе, Карлаў мост (усе ў Празе). У гатычным стылі перабудоўваліся старыя і будаваліся новыя гарады з рэгулярнай планіроўкай (Новы горад у Празе) і цэнтр. прамавугольнай плошчай (Чэске-Будзеёвіцы, Чэскі-Крум-

лаў). Замкі 13—16 ст. складаліся з «града» і «перадграддзя», звычайна мелі данжон, капліцу, унутр. двары з гатычнымі аркаднымі галерэямі, парадныя памяшканні з сеткавымі скляпеннямі (Кршываклат, Звікаў, Чэскі-Крумлаў, Карлштэйн). У 2-й пал. 15 — пач. 16 ст. ўзрос дэкор, ускладніліся ўзоры скляпенняў (Уладзіслаўская зала каралеўскага палаца ў Пражскім Градзе, сабор св. Барбары ў Кутна-Горы). Базілікальныя храмы змяняліся на зальныя. Падзеленыя на нефы залы набылі некат. ратушы (у Табары). З 1530-х г. пашырыўся стыль рэнесанс (палацы летні каралеўскі Бельведэр з «пяючым» фантанам, Шварцэнбергскі ў Празе). У перабудаваных замках з'явіліся аркадныя ўнутр. двары, лоджыі, садовыя павільёны, парадныя залы з размалёўкамі і лепкай (Літамішль, Йіндржыхуў-Градзец). Дамы і ратушы аздаблялі дэкар. атыкамі, узорыстымі франтонамі, арачнымі галерэямі, эркерамі, размалёўкамі сграфіта (у Табары, Тэльчы, Кутна-Горы). У 17—18 ст. дынамічна развіваўся стыль барока рэгіянальнага тыпу, адметны экспрэсіўным дэкорам, манументальнасцю, арган. сувяззю з горным ландшафтам. Вылучаліся 1-нефавыя ці цэнтрычныя з велічным купалам і вежамі сабор Ушэсця Маці Божай у Кутна-Горы, касцёл св. Ігнація ў Новым Горадзе, палацы Чэрнінскі, Вальдштэйнскі, Кінскіх, маляўнічыя палацава-паркавыя комплексы Міхнаўскі, Лобкавіцкі ў раёне Мала-Страна (усе ў Празе). У сярэдзіне 19 ст. сцвердзіўся кірунак т.зв. рамантыкі з уласцівымі яму тэндэнцыямі эклектыкі. Парадная манументальнасцю і багаццем убрання вылучаліся пабудовы ў духу неарэнесансу і неабарока ў Празе (Нац. т-р, музей). У канцы 19 — пач. 20 ст. пашырыўся стыль мадэрн з характэрнымі яму пошукамі нац. своеасаблівасці і тэндэнцыямі рацыяналізму (пабудовы Я.*Коцеры* ў Градзец-Кралаве і Просцеёве). Пераходам да архітэктуры функцыяналізму ў 1910-я г. адзначаны пабудовы І.*Гочара* і інш. (т. зв. чэш. кубізм). У

Да арт. **Чэхія**. Жывапісец т. зв. Майстар Тршэбанскага алтара. Уваскрэсенне. Каля 1380.

1930-я г. сфарміравалася нац. школа функцыяналізму (арх. Гочар, К.Гонзік, І.Гаўлічак, І.Крога). У Празе (1929) завершана зах. ч. сабора св. Віта (на аснове чарцяжоў і праектаў Парлержа), узведзены Нац. помнік Вызвалення на гары Віткаў (1929—32). У пасляваен. гады пабудаваны новыя жылыя раёны ў Празе, у гарадах Злін, Горні-Літвінаў, Оламаўц і інш., выраслі новыя гарады (Млада-Болеслаў). У 1934 у Празе пабудаваны адкрыты стадыён (Страгаўскі) на 240 тыс. гледачоў (самы буйны ў свеце). Пабудовы 2-й пал. 20 ст. адметныя функцыян. выразнасцю, рацыянальнай прастатой форм, выкарыстаннем сучасных матэрыялаў (шкло, бетон, алюміній, пластыкі). Пры ўзвядзенні спарт. і прамысл. збудаванняў выкарыстоўваюцца арыгінальныя зборныя канструкцыі (водны стадыён у р-не Падолі ў Празе, тэлевежа на гары Ештэд каля г. Ліберац). Узмацняюцца пошукі пластычнай выразнасці і індывід. аблічча будынкаў (Федэральны сход, «Дом, які танцуе», абодва ў Празе), вядзецца рэканструкцыя гіст. цэнтраў гарадоў, у т.л. Вацлаўскай пл. ў Празе). У аздабленні грамадскіх будынкаў (Чэш. тэлебачанне, 1980; Палац культуры, 1982, у Празе; універмаг «Дон» у Градзец-Кралаве, 1983) шырока выкарыстоўваюцца мясц. матэрыялы: шкло, фарфор, кераміка, дэкар. тканіны і інш.

Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Ранняе сярэдневяковае мастацтва бярэ пачатак ад эпохі росквіту Вялікамараўскай дзяржавы і ўзвышэння Чэш. княства. У мастацтве 11—13 ст. уплывы Германіі і Візантыі: мініяцюры «Вышаградскага кодэкса» (1085), размалёўкі ратонды св. Катаржыны ў Знойме (1134), рэльефы моста Юдзіфі ў Празе (1170) і інш. У 1-й пал. 14 ст. строгі кананізм вобразаў змяніўся лірычнымі і вытанчанымі выявамі (статуі т.зв. Майстра Міхельскай Мадонны). У 2-й пал. 14 ст. пашырылася готыка: скульпт. партрэты на трыфорыях сабора св. Віта ў Празе (скульпт. П.Парлерж з памочнікамі), жывапісныя выявы святых для капліцы замка Карлштэйн (майстар Тэадорык). Протарэнесансавыя тэндэнцыі выявіліся ў мініяцюры (малітоўнік Яна са Стршэды, каля 1364). З канца 14 ст. ў скульптуры і жывапісе пашырыўся т.зв. *мяккі стыль* (цыкл алтарных кампазіцый для сабора св. Ільі ў Тршэбані, жывапісец т.зв. Майстар Тршэбанскага алтара), узмацніўся свецкі і дэкар. пачатак. У мініяцюры і жывапісе пач. 15 ст. дэмакр. і антыклерыкальныя тэндэнцыі (творы т.зв. Майстра Райградскага алтара, мініяцюры «Гётынгенскага кодэкса». У познагатычную эпоху вылучалася скульптура т.зв. Майстра «Аплакванне» з Жэбрака. У 14—15 ст. дасягнула рас-



Да арт. **Чэхія**. Цэнтральная плошча ў г. Тэльч.

Да арт. **Чэхія**. М.Швабінскі. Бедны край. 1900.

квіту дэкар.-прыкладное мастацтва: маст. шкло, ювелірныя вырабы, кафля, мазаіка, вітраж. Рэнесанс у жывапісе найб. ярка выявіўся ў творчасці т.зв. Майстра Літамержыцкага алтара (алтар касцёла ў г. Літамержыц, размалёўкі ў капэле св. Вацлава ў саборы св. Віта ў Празе, абодва пач. 16 ст.), а таксама ў мініяцюры («Чэшскі канцыянал», «Іенскі кодэкс»). Развіваліся дэкар. ўбранне са стука, размалёўкі сграфіта, надмагіллі з партрэтнымі выявамі, медальернае мастацтва. На мяжы 16—17 ст. Прага стала адным з цэнтраў еўрап. маньерызму. Пры каралеўскім двары працавалі італьян., нідэрл., ням. майстры (Х. фон Ахен, А. дэ Врыс, Б.Спрангер і інш.). У эпоху барока (17—18 ст.) пачала фарміравацца нац. школа: партрэты і алтарныя кампазіцыі К.*Шкрэты*, П.Брандля, пейзажы і насценныя размалёўкі В.В.Рэйнера, партрэты *Я.Купецкага*, гравюры В.Голара, нацюрморты Я.Р.Біса. У скульптуры вылучаліся дэкар. статуі і групы Ф.М.Брокафа і М.Б.Браўна, у якіх уплыў Л.*Берніні*. У сярэдзіне 18 ст. будынкі аздабляліся ў стылях ракако і класіцызму (скульптура І.Ф.Платцэра, жывапіс Н.Грунда). У 17—18 ст. на высокім узроўні маст. шкло (гл. *Чэшскае шкло*), ювелірнае мастацтва, разьба па камені, апрацоўка металу, ткацтва. На развіццё мастацтва паўплывала заснаванне ў Празе «Патрыятычнага т-ва сяброў мастацтва» (1796) і Акадэміі мастацтва (1799). У 19 ст. пашыраны класіцызм і рамантызм: творы А.*Косарака*, А. і І. Манесаў (гл. ў арт. *Манес*), І.*Навраціла*, К.*Пуркіне*, Я.Чэрмака. У канцы 19 ст. вял. значэнне мела т.зв. пакаленне Нац. т-ра на чале з жывапісцам М.*Алешам*. Пленэрныя, рэаліст. пошукі характэрны для пейзажнага жывапісу (Ю.Маржак, А.Хітусі). Асновы чэш. скульпт. школы заклаў І.В.*Мысльбек*. У пач. 20 ст. нац. рэаліст. традыцыі спалучаліся з прыёмамі імпрэсіянізму і постімпрэсіянізму [А.Славічак (гл. ў арт. *Славічак*), А.*Гудачак*, Л.*Куба*], з'явілася абстрактнае мастацтва (Ф.*Купка*). Рысы сімвалізму ўласцівы работам Б.*Кафкі*, Я.*Прэйслера*, М.*Швабінскага*. Высокага ўзроўню дасягнула графіка, што развівалася ў рэчышчы мадэрну: плакаты А.*Мухі*, А.Хофбаўэра, кніжнае афармленне І.*Лады*, А.Кашпара, гравюры В.Прэйсіга. У стылі неакласіцызму работы Я.*Штурсы*, С.Сухарды і інш. У дэкар.-прыкладным мастацтве працавалі Ф.Білек, Муха, Сухарда. Да пач. 20 ст. адносіцца першая спроба сінтэзу мастацтваў (творчая садружнасць арх. Я.Коцеры з Прэйслерам, Сухардам, Штурсам). Зварот да еўрап. авангардызму (жывапіс Э.*Філы*, Б.Кубішты, В.Новака) спалучаўся са спробамі яго нац. пераасэнсавання (Я.Зрзаві, Р.Крэмлічка, В.Шпала, І.Чапек). У 1920—30-я г. склалася т.зв. сац. мастацтва (О.*Гутфройнд*, К.*Покарні*, жывапісцы К.Голан, М.Голі, П.Коцік, графік В.Сілаўскі, скульпт. К.Котрба, Я.Лаўда) з уласцівымі яму драматызмам, зваротам да прыёмаў экспрэсіянізму і прымітывізму. У работах Ф.*Музікі*, К.Тэйге, І.Шымы тэндэнцыі канструктывізму. У пасляваен. гады пашырана манум.-дэкар. мастацтва (мазаікі У.Сіхры, Швабінскага, сграфіта А.Забранскага, фрэскі В.Ціцельбаха), высокага ўзроўню дасягнулі кніжная графіка і плакат (Ц.Боўда, Музіка, К.Сволінскі, А.Стрнадэль, В.Фіяла), творчасць жывапісцаў І.Брожа, Я.Груса, Я.Славічака, Я.Сметаны, К.Соўчака. Для дэкар.-прыкладнога мастацтва характэрны пошукі выразных форм, выкарыстанне прыродных матэрыялаў (шкло Я.Брыхты, Л.Смрчковай, габелены і тканіны А.Кібаля, А.Фішарака, кераміка О.Экерта, В.Цікаля). Развівалася тэатр.-дэкарацыйнае мастацтва (І.Свобада, Ф.Трэстэр). Сярод мастакоў 2-й пал. 20 ст.: скульптары М.Аксман, Б.Добравольні, І.Маляёўскі, жывапісцы і графікі Брож, Забранскі, Соўчак, фотамастак К.Пліцкі. У традыц. нар. мастацтве захоўваецца вытв-сць набіўных тканін, кераміка, кавальства, жывапіс на шкле, драўляная скульптура. У 1948 засн. Саюз чэш. мастакоў.

Да арт. **Чэхія**. І.Ч а п е к. Агонь. 1939.

Музыка. Для чэш. нар. музыкі характэрна цесная ўзаемасувязь паміж песняй і танцам, аднагалосы склад мелодыкі. Разнастайныя танцы зводзяцца да 3 асн. тыпаў: жвавыя 2-дольныя (сярод іх полька), умерана хуткія плаўныя 3-дольныя і танцы з пераменным рытмам. Чэш. прафес. царк. і свецкая музыка складвалася ў 9—14 ст. Сярод першых чэш. кампазітараў і выканаўцаў 12 ст. Добржата, Коята. У 13 ст. песенная творчасць развівалася пад уплывам ням. *мінезінгераў*. З 15 ст. ўзмацнілася сац.-этычная роля музыкі (гусіцкія песні), пашырыліся шматгалосыя спевы (Я.Т.Турноўскі, К.Гарант з Полжыц і інш.). У 16 — пач. 17 ст. Прага — адзін з буйных муз. цэнтраў Еўропы. У 17 — сярэдзіне 18 ст. фарміравалася поліфанічная школа (Б.Чарнагорскі, Я.Зах, Ф.І.Тума, І.Н.Сегер, Ф.К.Брыксі і інш.). Чэш. музыканты зрабілі вял. ўклад у развіццё еўрап. сімфанізму, оперы, меладрамы, «камерных жанраў» (Ф. і І. Бенды, Я.Дусік, Я.Зеленка, І.Мыслівечак, Ф.К.Рыхтэр, А.Рэйха, К. і А. Стаміцы, А.Фільц). Нац.-вызв. рух 1-й пал. 19 ст. садзейнічаў актывізацыі муз. жыцця: у Празе адкрыліся кансерваторыя (1811), арганная школа (1831), Нац. т-р (1881), філармонія (1894); пачалося збіранне нар.

Да арт. **Чэхія**. Я.З р з а в і. Прыяцелькі. 1923.

Да арт. **Чэхія**. А.С т р н а д э л ь. Ілюстрацыя да кнігі І.Стрнадэля «Я выгнаў авечак на гару Яварнічак». 1963.

музыкі, фальклор. элементы ўвайшлі ў творы Я.Воржышака, В.Я.*Томашака*, Ф.Шкроўпа (аўтар першай оперы на чэш. тэкст «Дротар», 1826). Пачатак чэш. муз. класіцы паклалі оперы і сімф. творы Б.*Сметаны* і А.*Дворжака*. Розныя жанры нац. музыкі ўзбагаціў З.*Фібіх*. Традыцыі нац. класікі на мяжы 19—20 ст. працягвалі кампазітары О.Ераміяш, В.*Новак*, О.Острчыл, І.*Сук*, І.Б.*Фёрстэр*, Л.*Яначак*; еўрап. вядомасць набылі спевакі І.Леў, І.Палечак, М.Сітава, К.Чэх; скрыпачы Я.*Кубелік*, Ф.Лаўб, І.Славік, О.Шэўчык; віяланчэліст Г.*Віган*. На агульнаеўрап. класічныя і нац. традыцыі абапіраліся кампазітары 1920—30-х г. Ф.Барташ, П.Боржкавец, Я.Ежак, І.Крэйчы, Б.*Марціну*; кірунак, які знаходзіўся пад уплывам экспрэсіянізму, узначальваў А.Хаба. Павялічылася цікавасць да масавай песні, а таксама антыфаш. характару. Значны ўклад у муз. мастацтва 2-й пал. 20 ст. зрабілі кампазітары Я.Гануш, В.*Добіяш*, Г.Дусік, М.К.*Кабелач*, Д.*Кардаш*, Я.Сейдль, У.Сомер. У Ч. працуюць: оперныя т-ры, сімф. аркестры, камерна-інстр. ансамблі розных складаў [у т.л. Чэш. нанет (1923), Квартэт імя Б.Сметаны (1945), ансамбль песні і танца «Слук»], акадэміі прыгожых мастацтваў, кансерваторыі ў Празе і Брно. Праводзяцца штогоднія Міжнар. фестывалі «Пражская вясна» (у яго межах міжнар. конкурсы піяністаў, скрыпачоў, віяланчэлістаў, смыковых квартэтаў і інш.), джазавы фестываль у Празе.

Тэатр. Тэатральнае мастацтва ў Ч. развіваецца з 12 ст. У 16—17 ст. пашыраны школьны тэатр, якому процістаяў нар. аматарскі т-р. Першая школьная драма, напісаная і пастаўленая на чэш. мове, — «Чэшская камедыя пра багача Лазара» П.Кірмезера (выд. 1566). У 1737 у Празе пабудаваны «Тэатр у Котцу», дзе ставілі оперныя і драм. спектаклі. У 1783 адкрыўся Носіцкі т-р для спектакляў на ням. мове (з 1797 Саслоўны т-р), з 1785 у ім ставіліся спектаклі і на чэш. мове. У 1786—89 у т-ры «Боўда» 4 разы на тыдзень ішлі спектаклі на чэш. мове. У 1806 паказы на чэш. мове забаронены. З 1824 чэш. спектаклі ставіліся ў Саслоўным т-ры (рэж. Я.Штэпанек, акцёры Б.Альрамава, І.Грабінгер). У 1834 паказы на чэш. мове зноў спынены. Драматург І.К.Тыл аб'яднаў акцёраў у трупу, якая выступала як аматарскі калектыў «Тэатр у Каэтана» (да 1837). З 1846 спектаклі ў Саслоўным т-ры аднавіліся (кіраўнік Тыл). Да гэтага часу сцэн. мастацтва набыло рысы прафесіяналізму, пашырылася нац. драматургія. Рамант. кірунак у тэатр. мастацтве прадстаўляў акцёр, драматург і тэатр. дзеяч І.Колар. З 1845 Т-ва стварэння нац. чэш. т-ра на працягу многіх гадоў збірала сродкі на буд-ва тэатр. будынка. У 1862—83 у Празе працаваў Часовы т-р з опернай і драм. трупамі (рэжысёры І.Колар, Э.Хвалаўскі, акцёры Й.*Мошна*, Ф.Колар, О.Скленаржава-Мала, К.Шымanаўскі і інш.). У 1883 у Празе пабудаваны Нац. т-р, у які ўвайшлі драм. оперная і балетная трупы. Узніклі т-ры ў Пльзені (1865), Брно (1884), т-р на Каралеўскіх Вінаградах у Празе (1907) і інш. У 1919 арганізаваны Бродскі т-р у Брно, у 1920 — Гар. т-р у Оламаўцы. У Нац. т-ры пастаўлены п'есы «З жыцця насякомых» (1922, 1926, 1932), «Белая хвароба» (1937), «Маці» (1938) К.Чапека, «Дзіця» Ф.Шальды (1923) і інш. У «Вызваленым т-ры» (засн. ў 1925) рэж. І.Гонзль ставіў п'есы, якія папярэднічалі драматургіі абсурду. У 1933 Э.*Бурыян* стварыў т-р «Д-34». Для акцёраў характэрны імкненне да псіхал. раскрыцця сцэн. вобраза, увага да пластыкі, знешняга малюнка ролі (В.*Выдра*, Л.*Досталава*, Я.*Пруха*, З.Балдава, З.Штэпанек, О.Шэйнпфлугава і інш.). У 1940—50-я г. створаны Рэаліст. т-р (пазней імя З.Неедлы), «Т-р імя 5 мая», «Т-р сатыры» ў Празе. У канцы 1950 — пач. 60-х г. у Празе і Брно створаны невял. т-ры («малыя сцэны») «Ракако», «На Забрадлі», «Семафор» («Сем малых форм»), «За Бранай» і інш., дзе ставіліся п'есы маладых драматургаў В.Гавела, П.Когаўта. Сярод рэжысёраў: З.Калача, Я.Качар, З.Міка, К.Палаўш, П.Шэрхаўфер, акцёраў — Г.Врвнова, Б.Забарскі, І.Петравіцка, В.Ружак, І.Шворцава, В.Шмераль. Чэшскі Нац. т-р мае 4 сцэны: гіст. будынак т-ра (опера і балет), Саслоўны т-р (драматургічныя пастаноўкі), Колаўрацкі т-р (драматург. і оперныя пастаноўкі), т-р «Латэрна Магіка» (эксперым.). Сярод драм. т-раў: «На Вінаградах», «На Забрадлі», «На Фідлавачцы», «Без Забрадлі», «Пад Пальмаўкай», «Дэйвіцкі тэатр» і інш. Найб. вядомыя «т-ры малых форм» — «Семафор» і «Жыжкаўскі тэатр Яры Цымрмана» ў Празе. Працуе таксама Нар. т-р марыянетак, «т-ры ценяў» і інш. У 1957 створаны Саюз творчых работнікаў т-ра.

Кіно. У 1898 архітэктар і фатограф Я.Кршыжанецкі зняў дакумент. фільмы «Пажарныя», «Закладка падмурка пад помнік Палацкаму», а таксама ігравыя сцэнкі (сцэнарыст, рэж. і выканаўца комік І.Шваб-Маластранскі). У 1911 створана фірма «Кінафа», на якой здымалі пераважна хроніку і дакумент. фільмы, у 1912 — «Ілюзіён-фільм» і «Асум». У 1913 «Ілюзіён-фільм» экранізаваў п'есу Л.Строўпежніцкага «Благая кроў» (рэж. Э.Візнер), фірма «Асум» сістэматычна выпускала маст. фільмы рэж. М.Урбана («Канец кахання», «Прададзеная нявеста») і інш. Найб. значны фільм гэтага перыяду «Залатое сэрцайка» (паводле камедыі Шваба-Маластранскага, 1916, рэж. А.Фенцл). У

Да арт. **Чэхія**. Сцэна са спектакля «Кароль Лір» У.Шэкспіра. Нацыянальны тэатр у Празе.

Да арт. **Чэхія**. Сцэна са спектакля «Аіда» Дж.Вердзі. Пражская дзяржаўная опера.

Да арт. **Чэхія**. Канцэрт «Пражская вясна» ў Сметана Холе.

канцы 1910 — пач. 1920-х г. рэжысёры Я.С.Колар, К.Ламач, В.Маер, М.Новы, П.Пражскі пад уплывам амер. кіно ставілі салонныя меладрамы, прыгодніцкія і дэтэктыўныя фільмы, пад уплывам нямец. экспрэсіянізму — містычныя і фантаст. драмы. Спробы стварыць нац. кіно звязаны з гіст. жанрам: «Чэшскае неба» (1918, рэж. Я.А.Палаўш), «Праз цярні да славы» (1919, рэж. Р.Ф.Бранальд) і экранізацыяй твораў нац. л-ры. У 1931 засн. кінастудыя «Барандаўфільм». У пач. 1930-х г. здымаліся фільмы т.зв. малога рэалізму пра псіхалогію «маленькага чалавека»: «Імператарска-каралеўскі фельдмаршал» (1930, рэж. Ламач), «Мужчыны ў афсайце» (паводле К.Полачака, 1931, рэж. С.Інеман), «Антон Шпелец—снайпер» (1932, рэж. М.Фрыч) і інш.; гратэскна-фантаст. камедыі. Пошукам новых выразных сродкаў вылучаюцца фільмы У.Ванчуры: «Біржа працы» (1933), «Каханне і людзі» (1937), «Нашы чэшскія танцы» (1938, з В.Кубасекам). У 1939—45 экранізаваліся творы нац. л-ры, ставіліся забаўляльныя камедыі, у якіх здымаліся тэатр. акцёры Л.Пешак, Т.Піштак, Ф.Смолік і інш., а таксама патрыят. фільмы «Гэта быў чэшскі музыкант» (1940, рэж. В.Славінскі), «Гарадок на далоні» (паводле Я.Дрды, 1942, рэж. В.І.Бінавец). Адна з асн. тэм у 1940—50-я г. — 2-я сусв. вайна: «Людзі без крылаў» (рэж. Ф.Чап), «Героі не маўчаць» (рэж. М.Цыкан; абодва 1946), «Пастка» (1950, рэж. Фрыч), «У той раз на Каляды» (1958, рэж. К.Кахіня), «Рэпартаж з пятлёй на шыі» (1962, рэж. Я.Балік), эпічная трылогія О.*Ваўры* «Дні здрады» (1973), «Сакалова» (1974), «Вызваленне Прагі» (1976). Здымаліся камедыі: «Пекар імператара», «Імператар пекара» (абодва 1951, рэж. Фрыч), «Адпачынак з анёлам» (1953, рэж. Б.Земан, у сав. пракаце «Анёл у адпачынку»); гіст. фільмы, у т.л. гусіцкая трылогія Ваўры «Ян Гус» (1955), «Ян Жыжка» (1956), «Супраць усіх» (1958). Цікавасць да маральных праблем і даследавання характару сучасніка ў фільмах Кахіні («Кароль Шумавы», 1959), Ф.Влачыла («Белая галубка», 1960), У.Чэха («Дзе аднаго алібі мала», 1961). Тэматычнае і маст. абнаўленне чэш. кінематографа звязана з творчасцю прадстаўнікоў «новай чэхаславацкай кінахвалі»: В.Хіцілавай («Мех блох», «Пра нешта іншае», абодва 1964), М.Формана («Чорны Пётр», 1964; «Баль пажарнікаў», 1967), Э.Шорма («Вяртанне блуднага сына», 1966; «Дзень сёмы, восьмая ноч», 1969). З 1970-х г. кінематаграфісты імкнуцца адлюстраваць аб'ектыўную праўду жыцця і гіст. падзей, складаныя ўзаемаадносіны паміж людзьмі і грамадствам: «Ключ» (1976, рэж. Чэх), «Пра мараўскую зямлю» (1977, рэж. А.Кахлік), «Дзяўчынка з ракавінкамі» (1980, рэж. І.Свобада), «Звар'яцелы канкан» (рэж. Балік), «Вандраванні Яна Амаса» (абодва 1983, рэж. Ваўра). Сярод вядучых рэжысёраў: Д.Віганава, Кахіня, Д.Кляйн, І.Менцэль, Я.Немец, Я.Сверак, З.Трошка, Хіцілава, Я.Шваркмаер, Я.Шміт; акцёраў: З.Адамаўска, З.Быджаўска, М.Ванчурава, О.Візнер, Р.Грушынскі, М.Дзейдар, Я.Краўс, П.Кршыж, К.Родан, П.Форман, П.Чэпек і інш. Значнага ўзроўню дасягнула дакумент. кіно, мультыплікацыя (рэж. І.*Трнка*, Г.Тырлава, К.*Земан* і інш.). У 1992 засн. Дзярж. фонд Чэш. рэспублікі па развіцці кінематаграфіі. Побач з дзярж. кінастудыямі маст. фільмы здымаюць прыватныя фірмы. Праводзяцца міжнар. кінафестывалі ў Карлавых Варах (з 1946), «Залаты голем» у Празе (з 1995), тэлевізійных фільмаў «Злата Прага» і інш.

Беларусы ў Чэхіі. Бел. прысутнасць у Ч. вядома з часоў сярэдневякоўя. Гал. асяродкам беларусаў здаўна з'яўляецца яе сталіца, а ў 20 ст. стала адным з гал. цэнтраў бел. эміграцыі (гл. раздзел пра беларусаў у арт. *Прага*). У 1920—30-я г. ў Празе, Подзебрадзі, Пшыбраме, Брно і інш. чэш. гарадах дзякуючы матэр. падтрымцы чэхаславацкага ўрада і грамадскага Чэшска-ўкр. к-та дапамогі ўкр. і бел. студэнтам вучыліся каля 300 студэнтаў з Зах. Беларусі, у т.л. В.*Вальтар*, Я.*Мамонька*, С.Бусел, Я.Геніюш, Л.Красоўская, Л.Рыдлеўскі, М.Чарнецкі. Пры Укр. гасп. акадэміі ў Подзебрадзі у 1925—27 дзейнічаў Бел. студэнцкі гурток.

Літ.: Краткая история Чехословакии. М., 1988; Кузнецова Р. История чешской литературы. М., 1987; История литератур западных и южных славян. Т. 1—2. М., 1997; Маца И.Л. Архитектура Чехословакии. М., 1959; Поп И.И. Искусство Чехии и Моравии IX — начала XVI в. М., 1978; Гавлик Л. Искусство Чехословакии: Пер. с чеш. Прага, 1985; Современное чешское и словацкое искусство. Л. 1989; Ваницкий Я., Йиранек Я., Карасек Б. О чешской музыке: Пер. с чеш. М., 1965; Ёсць на карце месца...: Грамад.-культ. чыннасць бел. і рас. эміграцыі ў Чэхаславакіі, 1921—1938: Каталог. Мн., 2002.

Н.А.Сцепанюга (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *Л.В.Міхайлоўская і Н.А.Царук* (гісторыя), *Л.У.Языковіч* (асвета, навуковыя ўстановы), *Л.А.Фядотаў* (друк, радыё, тэлебачанне), *А.У.Вострыкава* (літаратура), *Я.Ф.Шунейка* (архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва), *Г.У.Шур* (кіно), *У.Я.Калаткоў* (беларусы ў Чэхіі).

ЧЭ́ЦВЕРНЯ, радовішча пяскоў у Жлобінскім р-не Гомельскай вобл., каля в. Чэцверня. Пластападобны паклад звязаны з эолавымі і алювіяльнымі адкладамі 1-й надпоймавай тэрасы р. Дняпро. Пяскі жоўтыя, шаравата-жоўтыя, шэрыя, дробна- і буйназярністыя, кварцавыя, з дамешкамі палявых шпатаў, месцамі гліністыя, з уключэннем дробнага жвіру. Разведаныя запасы 26,3 млн. т, перспектыўныя — 23,9 млн. т. Магутнасць карыснай тоўшчы 15,2—25 м, ускрышы (пяскі) 0,1—4 м. Пяскі пры ўмове абагачэння прыдатныя ў ліцейнай вытв-сці. *А.П.Шчураў.*

ЧЭ́ЦВЕРЦЬ, возера ў Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дзісна, за 10 км на Пд ад г. Паставы, за 1 км на У ад в. Падаляны. Пл. 0,46 км^2, даўж. 950 м, найб. шыр. 800 м, найб. глыб. 7,7 м, даўж. берагавой лініі 4,05 км. Пл. вадазбору 8,24 км^2. Катлавіна тэрмакарставага тыпу. Схілы катлавіны выш. 10—16 м, стромкія, на У і ПдУ пад лесам. Берагі стромкія, укрытыя воднабалотнай расліннасцю, на Пн пад хмызняком. Возера паўвостравам раздзелена на 2 плёсы: зах. мелкаводны і ўсх. глыбакаводны. Дно да глыб. 1—2 м пясчанае і пясчана-ілістае, ніжэй гліністае. На Пн выцякае ручай у воз. Світа.

ЧЭ́ЦІ, цэнтральныя дзярж. ўстановы Расіі 2-й пал. 16—17 ст. з фінансавай і адм.-суд. функцыямі ў адносінах да цяглага насельніцтва асобнай тэр. (напр., Наўгародская Ч., Уладзімірская Ч., Кастрамская Ч.). Узніклі пасля скасавання «*кармленняў*»; упершыню ўпамінаюцца ў 1561—62. Збіралі з падатковага насельніцтва «чацвяртныя падаткі», частку якіх перадавалі ў *прыказы*, з другой ч. выплачвалася жалаванне вышэйшым разрадам служылых людзей. Скасаваны ў выніку дзярж.-адм. пераўтварэнняў пач. 18 ст.

Літ.: Ерошкин Н.П. История государственных учреждений дореволюционной России. 3 изд. М., 1983.

ЧЭ́ЦЦІ-МІНЕ́І, гл. *Мінеі-Чэцці*.

ЧЭ́ЧАТ Віктар Уладзіміравіч (н. 3.7.1938, в. Ровенская Слабада Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. вучоны ў галіне педагогікі. Д-р пед. н. (1996), праф. (1997). Засл. работнік адукацыі Беларусі (1999). Скончыў Гомельскі пед. ін-т (1960). Настаўнічаў. З 1971 у Брэсцкім пед. ін-це (з 1976 заг. кафедры). З 1979 нам. дырэктара, заг. кафедры Нац. ін-та адукацыі Мін-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь. З 1998 у Бел. пед. ун-це, з 2001 прарэктар Ін-та павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў гэтага ун-та. Навук. працы па праблемах сямейнага, маральнага, патрыят. выхавання, сац. педагогікі, тэорыі і арганізацыі сац. работы, вышэйшай адукацыі, гісторыі педагогікі. Удзельнічаў у распрацоўцы Закона Рэспублікі Беларусь «Аб правах дзіцяці» (1993), рэсп. праграмы выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі (2000).

Тв.: Воспитание патриотических чувств. Мн., 1977; Умеем ли мы общаться с детьми? Мн., 1983; Патриотическое воспитание в семье. Мн., 1989; Педагогіка сямейнага выхавання: (тэарэтыка-метадал. аспект). Мн., 1995; Социальная работа с ребенком и семьей. Мн., 2000 (у сааўт.); Семья и дошкольное учреждение: взаимодействие в интересах ребенка. Мн., 2000 (разам з Т.М.Карасцялёвай); Педагогика семейного воспитания. Мозырь, 2003.

ЧЭ́ЧНЯ, Чэчэнская Рэспубліка (саманазва Ічкерыя). Размешчана на Пд еўрап. ч. Рас. Федэрацыі, на Паўн. Каўказе. Пл. 15,7 тыс. км^2.

Нас. 609,5 тыс. чал. (2001), гарадскога 26%. Сярэдняя шчыльнасць 38,8 чал. на 1 км^2. Жывуць чэчэнцы, рускія, інгушы і інш. Сталіца — г. *Грозны*.

Прырода. Займае цэнтр. ч. паўн. схілаў Вял. Каўказа (выш. да 4493 м, г. Тэбуласмта) і прылеглыя да яе Чэчэнскую раўніну і Церска-Кумскую нізіну. Карысныя выкапні: нафта, газ, мінер. буд. матэрыялы. Клімат кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад -3 °С на Церска-Кумскай нізіне да -12 °С у гарах, ліп. адпаведна 25 і 21 °С. Ападкаў 300—1000 мм за год. Гал. рэкі — Церак і Сунжа з прытокам Аргун. Глебы на раўніне каштанавыя, светла-каштанавыя і чарназёмныя, у гарах горна-лясныя і горна-лугавыя. Расліннасць на Церска-Кумскай нізіне палынна-салянкавая, на Чэчэнскай раўніне стэпавая і лесастэпавая, у гарах да 1600—2000 м шыракалістыя лясы (пераважна букавыя), вышэй — субальпійскія і альпійскія лугі. У складзе жывёльнага свету ў гарах каменная і лясная куніцы, буры мядзведзь, дзік, казуля, воўк, лясны кот, з птушак — чорнагаловы грыф, каменная курапатка, каўказскі цецярук, у стэпах і лесастэпах шмат грызуноў, з птушак — дзікія качкі, драфа, гусі, у далінах рэк — каўказскі фазан.

Гісторыя. Першыя звесткі аб чэчэнцах (саманазва н а х ч ы й) у арм. крыніцах 7 ст. н.э. Асн. іх заняткамі былі горная жывёлагадоўля і земляробства. У 10 ст. на тэр. Ч. з Грузіі пашырылася хрысціянства, у 16 ст. з Дагестана пачаў пашырацца *іслам*, які з 18 ст. стаў у Ч. пануючай рэлігіяй. У час *Персідскага паходу 1722—23* рас. войскі ўпершыню сустрэліся з плямёнамі нахчый каля аула Чэчэн, і з таго часу ў Расіі народ нахчый сталі наз. чэчэнцамі, а яго зямлю — Ч. Да 20 ст. тут захаваўся стараж. падзел на роды (тайпы) і звычай кроўнай помсты. Рас. імперыя шляхам ваен. экспедыцый і пабудовы крэпасцей імкнулася завяваць чэчэнцаў і выцесніць іх з урадлівых раўнін (засялялі казакамі) у горы. У *Каўказскую вайну 1817—64* горная Ч. была ядром дзяржавы *Шаміля*. Пасля яго капітуляцыі (1859) Ч. ў складзе Церскай вобл. У 1859—65 каля 22 тыс. чэчэнцаў перасяліліся ў Турцыю. У канцы 19 — пач. 20 ст. сельская гаспадарка станавілася таварнай, развівалася нафтаздабыча, пракладваліся чыгункі, крэпасць Грозная вырасла ў буйны эканам. цэнтр г. Грозны. Сав. ўлада ў Ч. ўстаноўлена ў студз.—сак. 1918, канчаткова — у сак. 1920. З 20.1.1921 Ч. ў складзе Горскай АССР, з якой 30.11.1922 вылучана Чэчэнская аўт. вобл. У студз. 1934 утворана Чэчэна-Інгушская аўт. вобл., 5.12.1936 — Чэчэна-Інгушская АССР (ЧІАССР) са сталіцай у г. Грозны. У вер. 1942 — студз. 1943 невял. ч. ЧІАССР акупіравана ням.-фаш. войскамі. У 1944 рэспубліка скасавана, чэчэнцы і інгушы (459 486 чал.) выселены ва ўсх. раёны СССР за «антысавецкія выступленні» і «супрацоўніцтва з немцамі». У 1944—57 большасць тэр. Ч. ў складзе Грозненскай вобл., паўд.-ўсх. раёны — Дагестана. 9.1.1957 ЧІАССР адноўлена, чэчэнцы і інгушы вернуты на месцы ранейшага жыхарства. З 2-й пал. 1980-х г. актывізаваўся рух за незалежнасць Ч. 27.11.1990 Вярх. Савет ЧІАССР абвясціў яе дзярж. суверэнітэт; створаны каардынацыйны орган чэчэнскага нац. руху — Выканком чэчэнскага нац. з'езда (з чэрв. 1991 — Агульнанац. кангрэс чэч. народа — АКЧН) на чале з ген.-маёрам Сав. Арміі Дж.Дудаевым. 3.9.1991 АКЧН зверг Вярх. Савет ЧІАССР. 27.10.1991 прэзідэнтам рэспублікі выбраны Дудаеў, які 2 ліст. абвясціў незалежную Чэч. Рэспубліку (Ічкерыю). Гэтыя акты не прызнала Рас. Федэрацыя. У снеж. 1991 утварылася асобная ад Ч. Інгушская Рэспубліка. Пасля безвынікових перагавораў рас. ўрад 26.11.1994 увёў у Ч. войскі для «навядзення канстытуцыйнага парадку». Быў сфарміраваны ўрад Ч. на чале з Д.Заўгаевым. Сепаратысты адышлі ў горы і разгарнулі дыверсійную вайну, у ходзе якой 22.4.1996 рас. вайскоўцамі забіты Дудаеў. У жн. 1996 атрады сепаратыстаў захапілі Грозны і неўзабаве, паводле пагаднення ў г. Хасан'юрт, рас. войскі пакінулі Ч. У студз. 1997 прэзідэнтам рэспублікі выбраны А.Масхадаў. 12.5.1997 ён падпісаў з рас. урадам мірны дагавор, паводле якога вызначэнне паліт. статусу Ч. адкладалася да 2000. Да канца 1990-х г. у Ч. аформіўся звязаны з міжнар. тэрарыст. групоўкамі моцна мілітарызаваны ісламскі паліт. рэжым вахабісцкага кшталту, які імкнуўся экспартаваць мусульм. паліт. экстрэмізм у суседнія рэспублікі Рас. Федэрацыі. У жн.—вер. 1999 рас. войскі адбілі ўварванне вахабітаў з Ч. ў Дагестан і ў канцы 1999 — пач. 2000, пасля працяглых баёў, зноў занялі Ч. Сепаратысты на чале з Масхадавым перайшлі да тэрарыст. метадаў барацьбы. З дапамогай федэральнага цэнтра часовая адміністрацыя на чале з А.Кадыравым пачала аднаўляць разбураную за часы баёў эканоміку рэспублікі. Намаганні ўрада Расіі па ўсталяванні міру ў Ч. падтрымлівае міжнар. супольнасць, якая разглядае дзейнасць чэчэнскіх сепаратыстаў як адну з праяў міжнар. *тэрарызму*. У сак. 2003 на рэферэндуме больш за 90% яго ўдзельнікаў прагаласавала за прыняцце канстытуцыі Ч., якая замацавала яе аўт. статус у складзе Рас. Федэрацыі. У кастр. 2003 паводле новай канстытуцыі прэзідэнтам Ч. абраны А.Кадыраў.

Да арт. **Чэчня**. Рака Церак.

Гаспадарка. Асн. галіны прам-сці — нафтаздабыўная, нафтаперапр. і нафтахімічная. Ч. панесла вял. страты ад ваен. дзеянняў, у выніку чаго значна знізіўся ўзровень эканам. развіцця. Здабыча нафты (у т.л. газавы кандэнсат) у 2000 склала 72,8 тыс. т, газу — 118 млн. м^3. Вытв-сць электраэнергіі 117 млн. кВт·гадз. (1998) пераважна на ЦЭЦ. Машынабудаванне (нафтавае абсталяванне, мед. інструменты і інш.), харч., лясная і дрэваапр., лёгкая, вытв-сць буд. матэрыялаў (цэмент і інш.). Маст. промыслы (разьба па дрэве, апрацоўка металу, дываначкацтва). Пладаводства. Вінаградарства. Пасяўныя пл. ў 1993 займалі 330,8 тыс. га, у т.л. пад збожжавымі культурамі (пшаніца, кукуруза, рыс) 46,2%, тэхн. (сланечнік, цукр. буракі) 5,8%, бульбай і агароднінай 4,7%, кармавымі культурамі 43,3%. Збор (тыс. т., 1993) збожжа — 213,4, бульбы — 36, агародніны — 49,2. Гадуюць танкарунных авечак, коз, буйн. раг. жывёлу (244,7 тыс. галоў, 1993), свіней (7,3 тыс. галоў). Птушкагадоўля. Шаўкаводства. Даўж. чыгункі 304 км, аўтадарог з цвёрдым пакрыццём 3057 км (2000). Гал. чыгунка Растоў-на-Доне—Баку, аўтадарогі Грозны—Уладзікаўказ, Грозны—Махачкала. Нафтаправоды Грозны—Туапсэ, Грозны—Махачкала, газаправод Грозны—Уладзікаўказ і інш.

Літаратура чэчэнскага народа развіваецца з пач. 20 ст. ў цеснай узаемасувязі з інгушскай л-рай (гл. ў арт. *Інгушэція*). Заснавальнік чэчэнскай л-ры — С.Бадуеў (аўтар першых аповесці «Голад» і рамана «Петымат», абодва 1930). Складальнік чэчэнскага алфавіта (на аснове лац. графікі) — Х.Ашаеў (аўтар нарысаў, п'ес, гіст.-рэв. тэтралогіі «Палымяныя гады», 1957—64). Асн. тэмы твораў пісьменнікаў — гіст. мінулае народа, грамадз. і Вял. Айч. войны, жыццё вёскі, духоўнае аблічча сучасніка і інш. Сярод паэтаў Р.*Ахматава*, М. і А. Мамакаевы, Н.Музаеў, М.Сулаеў, прозаікаў і драматургаў А.Айдамірaў, С.Арсанаў, У.Гайсултанаў, М.Мусаеў, А.Хамідаў. На бел. мову перакладзены асобныя творы М.Мамакаева, Ахматавай, М.Шамсуддзінава. Сярод перакладчыкаў Р.Баравікова, М.Маляўка.

Літ.: История Чечено-Ингушетии. Грозный, 1991; Берже А.П. Чечня и чеченцы. Грозный, 1991; Великая Н.Н., Хасбулатова З.И., Чахкиев Д.Ю. Очерки этнографии чеченцев и ингушей. Грозный, 1990; Далгат У.Б. Героический эпос чеченцев и ингушей. М., 1972; Новое и традиционное в культуре и быте народов Чечено-Ингушетии. Грозный, 1985; Общественные отношения у чеченцев и ингушей в дорево-

люционном прошлом (XVIII — нач. XX вв.). Грозный, 1982; Бугай Н.Ф. Правда о депортации чеченского и ингушского народов // Вопр. истории. 1990. №7; Очерк истории чечено-ингушской литературы. Грозный, 1963; Туркаев Х. Чеченская советская поэзия (20—40-е гг.). Грозный, 1971.

І.А.Літвіноўскі (гісторыя).

ЧЭЧЭ́НЦЫ (саманазва нохчый), народ у *Чэчні* і *Інгушэціі* (735,5 тыс. чал.), Дагестане (57,9 тыс. чал.). Жывуць таксама ў Казахстане (каля 50 тыс. чал.), Кыргызстане (2,6 тыс. чал.). Усяго ў Рас. Федэрацыі 899 тыс. чал. (1995). Агульная колькасць 957 тыс. чал. (сярэдзіна 1990-х г.). Гавораць на чэчэнскай мове. Вернікі — мусульмане-суніты.

ЧЭ́ШСКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1547, паўстанне ў Чэхіі супраць *Габсбургаў*. Выклікана падаткавым і рэліг. прыгнётам, ням. засіллем у дзяржаве; спробай Фердынанда I Габсбурга ўцягнуць чэш. саслоўі ў вайну супраць Шмалькальдэнскага саюза (аб'яднанне ням. пратэстантаў). Гал. рухальнай сілай Ч.п. былі каралеўскія гарады на чале з Прагай. Скліканы ў час паўстання чэш. сейм у сак. 1547 зацвердзіў патрабаванні саслоўяў да караля — 57 артыкулаў (рэгулярнае скліканне сейма, права свабодна выбіраць караля і інш.), выбраў з прадстаўнікоў саслоўяў правіцеля каралеўства і вярх. гетмана. У адказ войскі Фердынанда I у ліпені ўзялі ў аблогу Прагу. «Крывавы сейм» (жн. 1547) замацаваў перамогу Габсбургаў. 4 кіраўнікі паўстання пакараны смерцю, каралеўскія гарады заплацілі кантрыбуцыю, страцілі прывілеі; права на скліканне сеймаў і выбранне вышэйшых службовых асоб было замацавана за Габсбургамі.

ЧЭ́ШСКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1618—20, антыгабсбургскае паўстанне чэш. саслоўяў, якое стала зыходным пунктам *Трыццацігадовай вайны 1618—48*. Выклікана наступленнем *Габсбургаў* на паліт. і рэліг. правы Чэхіі, якая захоўвала пэўную незалежнасць у складзе габсбургскай манархіі. Пасля смерці імператара Матыяса чэш. саслоўі адмовіліся прызнаць яго пераемнікам Фердынанда II і выбралі чэш. каралём кіраўніка Пратэстанцкай уніі 1608 Фрыдрыха II Пфальцкага (жн. 1619). Войскі чэш. саслоўяў нанеслі шэраг паражэнняў імперскім войскам, двойчы ў 1619 бралі ў беспаспяховую аблогу Вену. Фердынанд II заключыў ваен. саюз з Каталіцкай лігай 1609, меў падтрымку рым. папы і Іспаніі. У 1620 у вырашальнай бітве каля *Белай Гары* чэш. войскі разбіты. 27 кіраўнікоў паўстання пакараны смерцю. У Чэхіі на 300 гадоў усталявалася неабмежаваная ўлада аўстр. Габсбургаў.

ЧЭ́ШСКАЕ ШКЛО, Багемскае шкло, мастацкі промысел Чэхіі. Развіваецца з 14—15 ст., росквіту дасягнула

Чэшскае шкло.

з канца 16 ст., калі прыдворны майстар імператара Рудольфа II К.Леман вынайшаў тэхніку разьбы (гравіроўкі) па шкле. Шырокую вядомасць набыло з 2-й пал. 17 ст., калі сталі вырабляць таўстасценнае кальцыева-вапнавае шкло (т.зв. чэшскі хрусталь), якое дапускала глыбокую агранку. У 2-й пал. 18—20 ст. развівалася ў рэчышчы існуючых стыляў. Для сучаснага Ч.ш. характэрны традыц. прыёмы агранкі і гравіроўкі ў спалучэнні з пошукамі пластычнай цэласнасці і выразнасці форм, тонкім выкарыстаннем светлавых і колеравых эфектаў.

Літ.: Современное чешское стекло: Пер. с чеш. М., 1973; Brychta J., Volf M. Živé sklo. Praha, 1977.

ЧЭ́ШСКАЯ ГУБА́, заліў у Баранцавым м., каля берагоў Расіі, паміж п-вам Канін і мацерыком. Даўж. 110 км, шыр. да 130 км, глыб. каля ўваходу да 55 м. Прылівы паўсутачныя (да 4,3 м). З ліст. да канца чэрв. ўкрыты лёдам. Упадаюць рэкі Ома, Пеша, Чэша.

ЧЭ́ШСКАЯ МО́ВА, адна са *славянскіх моў* (зах.-слав. група); дзярж. мова *Чэхіі* (да 1992 разам са *славацкай мовай* 6. Чэхаславакіі). Пашырана таксама ў ЗША, Канадзе, Аўстрыі. Мае 4 групы дыялектаў: уласна чэш., ганацкія, лашскія (сілезскія), мараўска-славацкія. Ч.м. ўласцівы: у фанетыцы — сталы экспіратарны націск на 1-м складзе, захаванне доўгіх галосных, пераход -or-, -ol-, -er-, -el- паміж зычнымі ў -ra-, -la-, -re-, -le-; пераход g→h, ŕ→ř, l' і l̄→l (сярэдняе), ō→ů→ū(ů), ý→ej, зліццё «y» і «i» ў адзін гук «i», у выніку пераразмеркавання палаталізацыі зычных а, á→ě, ie→í, u→i; у марфалогіі — знікненне парнага ліку, аорыста, імперфекта, адрозненне канчаткамі адушаўлёных і неадушаўлёных назоўнікаў і прыметнікаў м.р., наяўнасць малаўжывальных кароткіх прыметнікаў, кароткія і поўныя формы займеннікаў, формы роду і ліку ў дзеепрыслоўяў. Першыя пісьмовыя помнікі з 13 ст. Літ. Ч.м. склалася ў 14 ст., у 17 ст. заняпала. Адраджэнне пачалося ў канцы 18 ст. на аснове л-ры 16 — пач. 17 ст. Алфавіт на аснове лацінскага.

Літ.: Широкова А.Г. Чешский язык. М., 1961; Ивашина Н.В., Плотников Б.А. Чешский язык. Мн., 1985; гл. таксама да арт. *Славацкая мова*. *І.І.Лучыц-Федарэц.*

ЧЭ́ШСКІ МАСІ́Ў, Багемскі масіў, горны масіў на З Чэхіі і сумежных раёнах Польшчы, Германіі, Аўстрыі. Даўж. каля 500 км, шыр. да 300 км. Выш. да 1602 м (г. Снежка).

Уяўляе сабой выступ стараж. фундамента герцынскай складкавай вобласці. Складзены з гнейсаў, мігматытаў, крышт. сланцаў і гранулітаў пратэразою, сланцаў, кварцытаў і пясчанікаў палеазою, перакрыты асадкавым чахлом з мелавых і кайназойскіх парод. У выніку неаген-антрапагенавых тэктанічных рухаў масіў быў расколаты разломамі і скідамі, па якіх выліваліся вулканічныя лавы. З тэктанічным прагінам на ПнУ звязаны *Верхнесілезскі — Астраўска-Карвінскі каменнавугальны басейн.*

Цэнтр. частка (выш. 300—600 м) — узгорыстая раўніна з асобнымі падняццямі. Па ўскраінах горы: *Судэты, Рудныя горы*, Чэшскі Лес, Шумава і Чэшска-Мараўскае ўзвышша. На раўніне значная ч. тэр. апрацавана. У гарах да выш. 1200—1400 м мяшаныя і хвойныя лясы. Вышэй — субальпійскія лугі і хмызнякі. Мінер. крыніцы. Курорты, у т.л. *Карлавы Вары*. Турызм.

ЧЭ́ШСКІЯ БРАТЫ́, Багемскія браты, Мараўскія браты, чэшская рэлігійная секта, якая ўзнікла ў 15 ст. пасля паражэння *табарытаў* і аформілася ў незалежную ад папскага Рыма царк. арганізацыю. Першыя абшчыны Ч.б. засн. ў 1457 у Кунвальдзе (Чэхія) паслядоўнікамі П.*Хельчыцкага*. Ч.б. (першапачаткова сяляне і рамеснікі, пазней і заможныя гараджане, рыцары) адмаўлялі дзяржаву, саслоўі, прапа-

ведавалі беднасць, непраціўленне злу, з канца 15 ст. засяродзілі сваю дзейнасць на асвеце: засноўвалі школы, друкарні. З асяроддзя Ч.б. выйшлі вучоныя Я.А.*Каменскі*, Ян Благаслаў і інш. Ч.б. праследаваліся ўладамі, асабліва пасля разгрому антыгабсбургскага *Чэшскага паўстання 1547*. У 1575 Ч.б., лютэране і прадстаўнікі інш. пратэстанцкіх вераванняў у Чэхіі выпрацавалі адзіную «Чэшскую канфесію», якую ў 1609 прызнаў кароль Рудольф II. Пасля паражэння *Чэшскага паўстання 1618—20* былі разгромлены, выгнаны з Чэхіі і Маравіі. Іх паслядоўнікі ў 18 ст. стварылі *гернгутэрскія абшчыны* (у Германіі, Прыбалтыцы, Паўн. Амерыцы).

Ш

Ш, дваццаць сёмая літара бел. алфавіта. Паходзіць з кірыліцкай Ш («ша»).. У старабел. графіцы ў сувязі з функцыянаваннем розных пісьмовых школ і выкарыстаннем розных тыпаў пісьма (*устаў, паўустаў, скорапіс*) ужывалася ў некалькіх варыянтах, якія дапамагаюць вызначыць час і месца напісання помнікаў. Абазначала гук «ш» («нашъ», «чаша»). У 16 ст., акрамя рукапіснай, набыла друкаваную форму. У сучаснай бел. мове абазначае шумны глухі фрыкатыўны пяраднеязычны зацвярдзелы гук «ш» («шапка», «шаша»). Бывае вялікая і малая, мае рукапісную і друкаваную форму. *А.М.Булыка.*

ШАБА́ЙЛАЎ Віктар Іванавіч (н. 5.2.1931, в. Мікалаеўка Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. юрыст. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1986), д-р юрыд. н. (1980), праф. (1982). Засл. дз. нав. Беларусі (1994). Скончыў БДУ (1959), працаваў у ім з 1961. З 1964 у Ін-це філасофіі і права АН Беларусі (у 1974—94 заг. аддзела). З 1995 дырэктар Н.-д. цэнтра дзярж. кадравай палітыкі і ўдасканалення дзярж. кіраўніцтва. З 1997 у Канстытуцыйным судзе Рэспублікі Беларусь. З 2001 заг. аддзела Ін-та дзяржавы і права Нац. АН Беларусі. Навук. працы па праблемах дзярж. і сац.-культ. буд-ва, суверэнітэту, фарміравання грамадз. супольнасці і прававой дзяржавы, павышэння эфектыўнасці дзейнасці органаў дзярж. улады і кіравання. Удзельнічаў у распрацоўцы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 (са змяненнямі і дапаўненнямі, прынятай на рэсп. рэферэндуме 24.11.1996), шэрагу інш. заканад. актаў.

Тв.: Советское административное право: Управление социал.-культ. строительством. М., 1980 (у сааўт.); Правовое регулирование социально-культурной деятельности. Мн., 1981; Белорусская ССР: Статус, достижения, развитие. Мн., 1989 (у сааўт.); Понятие и содержание социально-экономических прав и свобод // Вестн. молодежного науч. о-ва. 2000. №4; Местное самоуправление в Республике Беларусь: состояние и перспективы развития // Журн. рос. права. 2002. №11.

ШАБАЛІ́Н Аляксандр Андрэевіч (н. 15.7.1938, в. Пухавічы Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.), бел. публіцыст, празаік. Засл. дз. культ. Беларусі (2000). Скончыў БДУ (1970). Працаваў у перыяд. друку, апараце ЦК КПБ. У 1978—2003 гал. рэдактар час. «Беларусь». Друкуецца з 1958. Аўтар кніг публіцыстыкі «Мы жывём у вёсцы» (1974, з С.Барадоўскім), «Уладзімір Кавалёнак» (1983), «Дыялогі пра мараль» (1983). Піша апавяданні. Адзін з аўтараў сцэнарыяў дакумент. тэлевізійных і маст. фільмаў «Твой дом на зямлі» (1973), «Людзі, людзі — высокія зоркі...» (1975), «Хто сёння адсутны» (1988) і інш. *Л.С.Савік.*

ШАБАЛІ́Н Вісарыён Якаўлевіч (11.6.1902, г. Омск, Расія — 28.5.1963), расійскі кампазітар, педагог. Нар. арт. Расіі (1947). Д-р мастацтвазнаўства (1941). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1928, кл. М.*Мяскоўскага*), з 1928 выкладаў у ёй (з перапынкам; з 1935 праф., у 1942—48 дырэктар). Яго творам уласцівы высакароднасць мелодыкі, пранікнёны лірызм, этычны пафас. Зрабіў вял. ўклад у развіццё сав. камернай і харавой музыкі. Сярод твораў: опера «Утаймаванне свавольніцы» (паст. 1957; у опернай студыі Бел. кансерваторыі 1965), кантаты, у т.л. «Масква» (1946); 5 сімфоній (1925—62); канцэрт для скр. з арк. (1940), канцэрціна для скр. і стр. арк. (1932; 2-я рэд. 1958) і для валторны і малога арк. (1930, 2-я рэд. 1959); 9 стр. квартэтаў (1923—63); хары a capella на вершы А.Пушкіна (1949); М.Танка (1950) і інш.; творы для голасу з фп.; рамансы, музыка да драм. спектакляў і кіно. Завяршыў і адрэдагаваў оперы «Сарочынскі кірмаш» і «Саламба» М.Мусаргскага, «Ваявода» П.Чайкоўскага, «Сімфонію на 2 рускія тэмы» М.Глінкі і інш. Сярод вучняў Ю.Аляксандраў, С.*Губайдуліна*, А.*Пахмутава*, К.*Хачатуран*, Ц.*Хрэннікаў*. Дзярж. прэміі СССР 1943, 1947.

Літ.: В.Я.Шебалин: Статьи. Воспоминания. Материалы. М., 1970; Шебалина А. В.Я.Шебалин: Годы жизни и творчества. М., 1989.

ШАБА́Н Барыс Тарасавіч (н. 22.5.1923, Масква), Герой Сав. Саюза (1943). Беларус. Скончыў 3-е Ленінградскае артыл. вучылішча (1942), Ваен. акадэмію

Б.Т.**Шабан**.

К.А.**Шабан**.

бранятанк. і механіз. войск (1951). У Чырв. Арміі з ліп. 1941. У Вял. Айч. вайну з крас. 1942 на Бранскім, Цэнтр. і 1-м Бел. франтах. Камандзір мінамётнага ўзвода ст. лейтэнант Ш. у час Курскай бітвы 1943 падбіў з процітанк. ружжа 2 бронетранспарцёры і танк праціўніка; акружаны гітлераўцамі, закідаў іх гранатамі і вынес параненага разведчыка. Як камандзір батарэі вызначыўся ў баях каля г.п. Радуль Чарнігаўскай вобл.: 15 кастр. арганізаваў пераправу на падручных сродках батарэі, якая адбіла некалькі контратак ворага, чым паспрыяла наступленню асн. сіл палка. Да 1985 у Сав. Арміі.

ШАБА́Н Казімір Аркадзевіч (22.6.1922, в. Шабаны, цяпер у межах Мінска — 9.7.1945), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Тамбоўскую школу ваен. пілотаў (1942). У Чырв. Арміі з 1940. У Вял. Айч. вайну з мая 1943 на Варонежскім, 1-м і 2-м Укр. франтах. Удзельнік Курскай бітвы, Корсунь-Шаўчэнкаўскай і Львоўска-Сандамірскай аперацый, вызвалення Румыніі, Венгрыі, Чэхаславакіі. Лётчык штурмавога авіяпалка ст. лейтэнант Ш. да ліп. 1944 зрабіў 123 баявыя вылеты. Загінуў у авіякатастрофе.

ШАБА́Н Яўген Пятровіч (29.12.1936, в. Калодзіна Мядзельскага р-на Мінскай

вобл. — 30.7.1982), бел. паэт і драматург. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1958). Працаваў акцёрам, пам. гал. рэжысёра па літ. частцы Бел. т-ра імя Я.Коласа (1958—65), Бел. т-ра імя Я.Купалы (1976—80), у 1965—76 рэжысёр на Бел. тэлебачанні. Друкаваўся з 1960. Аўтар зб-каў вершаў «Нарачанка» (1969), «Чырвоныя сумёты» (1977), п'ес «Сіні снег» (паст. 1975, Бел. рэсп. т-р юнага гледача), «Чахарда» (нап. 1976), «Шрамы» (паст. 1977), «Чалавек з легенды» (з І.Ражковым; паст. 1978; абедзве т-р імя Я.Купалы), «Востраў Алены» (паст. 1982, т-р імя Я.Коласа), лібрэта тэлеоперы «Ранак» (паст. 1968), сцэнарыяў, шэрагу тэлеспектакляў і інш. П'есам уласцівы вострыя канфліктныя сітуацыі, акрэсленая праблемнасць, лірызм. На бел. мову пераклаў асобныя творы М.Шолахава, В.Шукшына, Н.Думбадзе, Ю.Тууліка і інш.

Тв.: П'есы. Мн., 1983. *С.С.Лаўшук.*

ШАБА́НАЎ Вячаслаў Барысавіч (н. 24.2.1959, г. Магілёў), бел. юрыст. Д-р юрыд. н. (2003), праф. (2002). Скончыў Вільнюскую спец. школу падрыхтоўкі нач. саставу МУС СССР (1983), Гродзенскі ун-т (1991). З 1977 працаваў на гасп. прадпрыемствах. З 1983 на камандна-адм. пасадах МУС, з 1993 у апараце МУС Рэспублікі Беларусь (у 1999—2002 нам. нач. камітэта — нач. управлення). З 2002 у Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь. Навук. працы ў галіне крымін. і крымін.-выканаўчага права, крыміналістыкі, аператыўна-вышуковай дзейнасці.

Тв.: История исправительно-трудовых учреждений Беларуси. Мн., 1999 (у сааўт.); Организационные и правовые проблемы предупреждения и раскрытия преступлений в исправительных учреждениях. Мн., 2001; Теоретические основы уголовно-исполнительного права. Мн., 2002 (у сааўт.).

ША́БАШ, ш а б а с (ад стараж.-яўр. субота), 1) суботняе свята ў вернікаў яўрэяў, прадпісанае *іудаізмам*. 2) У сярэдневяковых павер'ях — начное зборышча ведзьмакоў і ведзьмаў, якія ўчынялі шалёны разгул. 3) У пераносным сэнсе — назва любога зверскага ўчынку, варожага разгулу. 4) Заканчэнне работы; перапынак для адпачынку.

ШАБЁКА Васа Фёдараўна (н. 3.9.1916, г. Магілёў), бел. вучоны ў галіне меліярацыі. Д-р тэхн. н. (1968), праф. (1969). Засл. меліяратар Беларусі (1968). Скончыла БПІ (1940). З 1944 у Белпрампраекце. У 1946—98 у Бел. НДІ меліярацыі і лугаводства (у 1953—86 заг. аддзела, лабараторыі). Навук. працы па праблемах рэгулявання воднага рэжыму, рацыянальнага выкарыстання водных рэсурсаў, удасканальвання асушальна-ўвільгатняльных сістэм пры меліярацыі зямель.

Тв.: Изменение микроклимата под влиянием мелиорации болот. Мн., 1977; Влияние осушительных мелиораций на водный режим территорий. Мн., 1983; Водохозяйственные расчеты при мелиорации переувлажненных земель. Мн., 2000.

ШАБЁКА Леанід Сцяпанавіч (н. 3.7.1941, в. Цясова Салігорскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне тэхналогіі машынабудавання, педагог. Д-р пед. н. (1996), праф. (1993). Скончыў БПІ (1966). З 1973 у Бел. нац. тэхн. ун-це (у 1974—2001 заг. кафедры). Навук. працы па апрацоўцы металаў ціскам, формаўтварэнні ў тэхнал. працэсах, праблемах выкладання нарысоўнай геаметрыі і інж. графікі. Распрацаваў метадычную сістэму геам. забеспячэння цэласнай графічнай падрыхтоўкі інжынераў, асн. прынцыпы выкладання графічных дысцыплін на розных ступенях адукацыі.

Тв.: Начертательная геометрия. Мн., 1991; Обучение начертательной геометрии на базе трехмерных компьютерных моделей (разам з А.І.Старажылавым) // Новые технологии в машиностроении и вычислительной технике. Брест, 1998. Ч. 1.

ША́БЕЛЬНІК (Comarum), род кветкавых раслін сям. ружавых. 2 віды. Пашыраны ў Паўн. паўшар'і. На Беларусі 1 від — Ш. балотны (C. palustre), нар. назвы балотная ружа, ракаўнік, бацяновы ножкі. Трапляецца на нізінных балотах і забалочаных лугах, па берагах рэк і азёр.

Ш. балотны — шматгадовая травяністая расліна з доўгім паўзучым карэнішчам. Сцябло прыўзнятае, у верхняй ч. ўкрытае валаскамі і залозкамі. Лісце доўгачаранковае, няпарнаперыстае. Кветкі цёмна-чырв. па 2—5 у шчыткападобным суквецці. Плод — шматарэшак. Лек., меданосная, дубільная і фарбавальная расліна.

Шабельнік балотны.



Шаберы: а — ручныя (1 — плоскі састаўны, 2 — трохгранны, 3 — лапатачны); б — электрамеханічны (1 — цялежка, 2 — электрарухавік, 3 — рэдуктар, 4 — гнуткі вал, 5 — крывашып, 6 — шабер).

ША́БЕР (ням. Schaber ад schaben скрэбці), ручны або механізаваны інструмент для аддзелачнай апрацоўкі паверхні металаў саскрабаннем тонкай стружкі (шабраннем). Выкарыстоўваецца для падгонкі плоскіх, канічных і цыліндрычных паверхняў. Ёсць Ш. для выраўноўвання зярністай паверхні метал. дошкі пры гравіраванні ў тэхніцы *мецца-тынта* і інш.

ШАБЁТА, к а л і т а, к а й с ц е р к а, у беларусаў невялікая скураная сумачка-кашалёк, у якой насілі крэсіва, сцізорык, люльку, тытунь, медзякі і інш. дробязь. У 18—19 ст. насілі з правага боку, мацавалі да пояса або да раменьчыка, перакінутага цераз плячо. Мела форму прамавугольніка (9—16 × 8—12 см) з 1 або 2 кляпамі на ўсю шырыню, некалькі ўнутр. адсекаў, фігурны верх, аздоблены арнаментам з рамбічнай сеткі, крыжыкаў, хвалістых ліній, кружкоў,

утвораных цісненнем і прасечкай. На Падняпроўі вядомы Ш. аб'ёмныя, авальнай формы. Ш. ўпрыгожвалі дэкар. штапам, аплікацыяй, наразнымі скуранымі мохрыкамі, вышыўкай, пляценнем з дробных раменьчыкаў, набіўкамі латунных цвічкоў з блішчастымі плешкамі. Найб. пашырана на Палессі.

М.Ф.Раманюк.

ШАБЛО́Н (ад ням. Schablone узор), 1) узор, па якім надаюць вырабам пэўную форму і памеры, праводзяць крывыя лініі на чарцяжах. Бывае ў выглядзе пласціны з выразам, абрыс якога адпавядае контуру чарцяжа або вырабу, літары, лічбы і г.д.; выкарыстоўваецца для вычэрчвання дэталей, надпісаў і інш. 2) Інструмент для вызначэння шагу стандартных разьбаў (разьбовы Ш.), праверкі радыусаў крывізны паверхняў (радыусны Ш.), профілю дэталі (профільны Ш.), памераў зубоў зубчастых колаў і інш. 3) Вымяральны інструмент для кантролю складаных профіляў — нармальны *калібр*. 4) Чарцёж арх., буд. і інш. дэталі, выкананы ў натуральную велічыню. 5) Варштат, на якім збіраюць стандартныя буд. дэталі. 6) Агульнавядомы, збіты ўзор, які слепа перайманць; штамп.



Шаблоны: 1 — разьбовыя; 2 — радыусныя.

ШАБЛО́ЎСКАЯ Ірына Вікенцьеўна (н. 12.12.1939, Мінск), бел. літаратуразнавец. Д-р філал. н. (1988), праф. (1988). Скончыла БДУ (1962), з 1969 працуе ў ім (у 1979—2001 заг. кафедры). Даследуе чэш. і славянскія л-ры 20 ст., пытанні іх параўнальнага аналізу з бел. л-рай у кантэксце сусветнай. Аўтар манаграфіі «Самай высокай мерай: Сучасная проза еўрапейскіх сацыялістычных краін пра вайну» (1984), вучэбных дапаможнікаў «Паэтыка чэшскага рамана XX ст.» (1995), «Гісторыя замежнай літаратуры: (XX ст., першая палова)» (1998), а таксама праграмы курса гісторыі чэш. л-ры для студэнтаў на бел. мове (1998) і інш. На бел. і рус. мовы пераклала кн. «Дужасць нядужых» В.Гавела (1991), аповесць «Маё дзіўнае вужаня» С.Рудольфа (1998), творы Б.Грабала, М.Мацсурка.

ШАБЛО́ЎСКІ Алег Нічыпаравіч (н. 24.8.1948, Мінск), бел. вучоны ў галіне гідрагазадынамікі і цеплафізікі. Д-р фіз.-матэм. н. (1994), праф. (1996). Акад. Бел. інж. акадэміі (1999). Скончыў Томскі ун-т (1971). З 1972 у НДІ прыкладной матэматыкі і механікі Томскага ун-та. З 1981 у Гомельскім тэхн. ун-це (з 1983 заг. кафедры). Навук. працы па дынаміцы імпульсных газавых машын, канвектыўна-хвалевых працэсах у гідрадынамічных сістэмах, высокаінтэнсіўных цеплавых працэсах у матэрыялах. Развіў тэорыю віхраў у гідрадынамічных сістэмах з вял. разрывамі, распрацаваў тэарэт. метады даследавання лакальнанераўнаважнага цеплапераносу ў асяроддзях з нелінейнымі цеплафіз. ўласцівасцямі.

Тв.: Динамика вихрей и теплоперенос в потоке вязкой жидкости. Гомель, 2001; Релаксационный теплоперенос в нелинейных средах. Гомель, 2003.

ШАБЛО́ЎСКІ Уладзімір Васілевіч (15.7.1908, в. Запалянне Слаўгарадскага р-на Магілёўскай вобл. — 24.6.1941), адзін з кіраўнікоў *Брэсцкай крэпасці абароны 1941*. З 1930 у Чырв. Арміі. З 1940 камандзір батальёна 125-га стралк. палка, раскватараванага ў Брэсцкай крэпасці. Капітан Ш. ўзначальваў абарону Кобрынскага ўмацавання. 24.6.1941 паранены трапіў у палон, загінуў пры спробе ўцячы.

ША́БЛЯ (венг. szablya ад szabni рэзаць), від сякучай або сякуча-колючай *халоднай зброі*. Складаецца са стальнога клінка з выгнутым лязом, увагнутай спінкай, вастрыём на канцы і эфеса (рукаятка з цемляком і крыжавіны з перакрыжаваннем ва ўсх. Ш., або рукаяткі і гарды ў еўрап. Ш.); укладваецца ў ножны. Даўжыня 800—900 мм, шырыня 3—3,5 см. Першапачаткова вядома ў Персіі, Асірыі, Егіпце. У 9 ст. ад хазараў, полаўцаў і печанегаў трапіла на ўсх.-слав. землі; у рус. летапісах згадваецца з 10 ст. На Беларусі пад уплывам польскага і венг. ваен. мастацтва Ш. шырока выкарыстоўвалася з канца 16 ст., калі стала часткай баявога рыштунку лёгкай кавалерыі і ўлюбёнай зброяй шляхты. У 17 ст. шабельнікі ВКЛ сканструявалі «фурдумент» — спец. шчыток, які закрываў кісць рукі. Ш. бел. майстроў, у прыватнасці магілёўскіх, у 17 ст. карысталіся попытам у Польшчы і Расіі. З 18 ст. ў Еўропе і Расіі Ш. была на ўзбраенні лёгкай конніцы і каманднага складу ўсіх родаў войск. У 1881 у рас. арміі заменена *шашкай* і захавалася толькі ў гвардыі як парадная зброя. У СССР у 1940 уведзена парадная Ш. для генералаў, у 1949 заменена корцікам. Ш. эспадрон (франц. espadon ад ісп. espada *шпага*), колючая і сякучая зброя ў спарт. *фехтаванні*.

ШАБЛЯЗУ́БЫЯ ТЫ́ГРЫ, род вымерлых жывёл; гл. *Махайроды*.

ШАБО́ВІЧ Мікола (Мікалай Віктаравіч; н. 4.1.1959, в. Бадзені Мядзельскага р-на Мінскай вобл.), бел. паэт. Скончыў Мінскі пед. ін-т (1981). У 1981—86 настаўнічаў. З 1989 працуе ў Бел. пед. ун-це, адначасова ў 1992—2002 заг. літ.-драм. часткі Мінскага абл. драм. т-ра ў г. Маладзечна. Друкуецца з 1976. У паэт. зб-ках «Дом», «Яшчэ пакуль не лістапад...» (абодва 1996), «Падары мне сваю адзіноту» (2002) філас. роздум, любоў да родных мясцін, тэма кахання. Многія яго вершы пакладзены на музыку.

Тв.: Каб вымавіць: «Люблю!» // Крыло. Мн., 1984.

Літ.: Старасценка Т. «Мой светлы дом адкрыты для гасцей...»: (Штрыхі да творчага партрэта Міколы Шабовіча) // Крыніца: Славянскі свет. 2003. №3. *А.В.Спрынчан.*

ШАБРО́ЛЬ (Chabrol) Клод (н. 24.6.1930, Парыж), французскі кінарэжысёр. Пачынаў як кінакрытык. Першы фільм «Прыгажунчык Серж» (1958, прэмія Міжнар. кінафестывалю ў г. Лакарна, Швейцарыя) вызначыў стылістыку і пошукі «новай хвалі» франц. кіно. Майстар інтрыгі. Галоўнае для яго аналіз чалавечых характараў. Атмасфера і норавы франц. правінцыі ў цэнтры фільмаў «Кузены» (1959, гал. прэмія Міжнар. кінафестывалю ў Зах. Берліне), «Ландру» (1963), «Крывавае вяселле» (1973), «Мадам Бавары» (1991) і інш. Сярод інш. фільмаў: «Пекла» (1994), «Кіпрыёт Катсарыс» (1996, тэлевізій-

Гусарскія **шаблі** ўзору 16 ст. Венгрыя.

ны), «Жаночая гісторыя» (1998), «Колер хлусні» (1999), «Дзякуй за шакаладку» (2000). Аўтар сцэнарыяў многіх сваіх фільмаў. *Г.У.Шур.*

ШАБРЫНСКІ, біялагічны заказнік рэсп. значэння ў Добрушскім р-не Гомельскай вобл. Засн. ў 1978 для аховы і рацыянальнага выкарыстання прыродных запасаў лек. раслін. Пл. 3,3 тыс. га. Спадзістахвалістая тэраса з дзюнамі, марэннымі ўзгоркамі, лагчынамі. Глебы дзярнова-падзолістыя забалочаныя, пясчана-супясчаныя. Хваёвыя, шыракаліста-хваёвыя, дубовыя лясы, участкі пазапоймавых лугоў. Лек. расліны: ландыш майскі, рабіна, святаяннік, талакнянка, чына горная, дуброўка белая. У Чырв. кнізе шалфей лугавы, лілея кучаравая, жаўтазель германскі, канюшына лубінавая, дзікая пятрушка аленевая, рамоначнік шчытковы, чарнакорань пурпуровы. Радыеактыўна забруджаны. *П.І.Лабанок.*

ШАБУЕЎ Васіль Казьміч (13.4.1777, г. Кранштат, Расія — 28.6.1855), рускі жывапісец, адзін з майстроў позняга *класіцызму* і *акадэмізму*. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1782—97), з 1807 выкладаў у ёй (з 1812 праф., з 1832 рэктар). У 1803—07 пенсіянер АМ у Рыме. Творчасць вылучаецца строга акадэмічным малюнкам, удалай кампаноўкай шматфігурных сцэн, цікавасцю да нац. гісторыі: «Подзвіг купца Іголкіна» (1839). Некат. творам уласцівы рысы рамантызму і рэалізму: «Варажба. Аўтапартрэт» (1805), «Партрэт адстаўнога чыноўніка Швыкіна» (1833).

Літ.: Круглова В. В.К.Шебуев. Л., 1982.

ШАБУНЕЎСКІ Станіслаў Данілавіч (1868, Мазырскі р-н Гомельскай вобл. — 1937), бел. архітэктар. Скончыў Пецярбургскі ін-т грамадз. архітэктараў (1897). У 1897—1937 гомельскі гар. архітэктар. Паводле яго праектаў у Гомелі пабудаваны *Гомельскай мужчынскай гімназіі будынак, Гомельскага камерцыйнага банка будынак, Гомельскі дом-камуна*, Арлоўскі камерцыйны банк (1901, цяпер грамадскі цэнтр на рагу вуліц Савецкай і Першамайскай), жылы дом на рагу вуліц Баярскай і Мільённай (1909, цяпер на рагу вуліц Баўмана і Білецкага), гасцініца «Савой» (1912, не захавалася), земская бальніца і ваен. шпіталь (1914, цяпер корпус бальніцы хуткай дапамогі і ваен. шпіталь) і інш. Кіраваў аднаўленнем згарэлай ч. палаца (1923) Гомельскага палацава-паркавага ансамбля, складаў праекты добраўпарадкавання вул. Савецкай, тэр. т.зв. гарэлага балота (1925). У 1937 рэпрэсіраваны. *В.М.Чарнатаў.*

ШАБУ́НЯ Антон Апалінаравіч (1876 — 3.2.1920), бел. паліт. дзеяч; адзін з лідэраў *Беларускай сацыялістычнай грамады* (БСГ, падп. мянушка Ф а м а). Скончыў Маскоўскі ун-т. У 1905—07 працаваў пам. прысяжнага паверанага ў Мінску. Дэлегат 2-га з'езда БСГ (студз. 1906) у Мінску. Яго кватэра па вул. Праабражэнскай (цяпер вул. Інтэрнацыянальная) і фальварак у Ігуменскім пав. (каля г.п. Пухавічы) былі канспіратыўнымі. Адзін з заснавальнікаў кніжнага т-ва «*Мінчук*». У студз. 1906 мінская жандармерыя завяла справу па абвінавачанні Ш. ў распаўсюджванні «супрацьурадавых выданняў» (спынена ў 1909 за недастатковасцю ўлік).



С.Д.Шабунеўскі.

К.І.Шабуня.

Літ.: Каганец К. Творы. Мн., 1979; Луцкевіч А. За дваццаць пяць гадоў (1903—1928): Успаміны аб працы першых бел. паліт. арг.: Бел. рэв. грамада, Бел. сац. грамада. Мн., 1991. С. 9, 22—23; А[ляксандр] У[ласаў]. Страты інтэлектуальных сіл Менска // Беларусь. 1920. 5 сак.; Автобиография... Ефима Гальперина // Народны камісарыят сацыяльнай апекі БССР. Мн., 1924. С. 47.

В.У.Скалабан.

ШАБУ́НЯ Канстанцін Іванавіч (28.10.1912, в. Даўгінічы Уздзенскага р-на Мінскай вобл. — 13.10.1984), бел. гісторык. Чл.-кар. АН Беларусі (1969), д-р гіст. н. (1964), праф. (1966). Засл. дз. нав. Беларусі (1975). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1937). У 1940—41 выкладчык гісторыі ў БДУ. З 1946 у Ін-це гісторыі АН Беларусі. З 1948 у ЦК КПБ (кансультант, заг. сектара, нам. заг. аддзела). З 1956 у Ін-це гісторыі АН Беларусі (заг. сектара публікацый, гісторыі Беларусі дасав. грамадства), адначасова выкладаў у ВНУ Мінска. Даследаваў гісторыю сялянства і сельскай гаспадаркі Беларусі ў 2-й пал. 19 ст., сял. рух у рэвалюцыю 1905—07, дзейнасць арг-цый РСДРП. Адзін з аўтараў і рэдактараў «Гісторыі Беларускай ССР» у 5 тамах (т. 1—2, 1972), «Гісторыі рабочага класа Беларускай ССР» у 4 тамах (т. 1, 1984).

Тв.: Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг. Мн., 1962. *М.М.Смальянінаў.*

ША́ВЕЛЬ Кастусь (Канстанцін Міхайлавіч; 5.6.1912, в. Кухцічы Уздзенскага р-на Мінскай вобл. — 19.8.1987), бел. паэт. Скончыў Мінскі пед. ін-т (1938). Настаўнічаў, з 1956 працаваў у калгасе. Друкаваўся з 1927. У кн. паэзіі «Мой кут салаўіны» (1967), «Музыка нівы» (1977), «Пахне бяроста» (1978), «Цалуйце хлеб» (1981), «Асеннія пракосы» (1983) любоў да Бацькаўшчыны, глыбокая сувязь з прыродай, тэма кахання.

ША́ВЕЛЬ Міхаіл Аляксандравіч (н. 5.8.1949, в. Вільянава Пружанскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. тэатральны дзеяч. Засл. дз. культуры Беларусі (2000). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1972). З 1974 у брэсцкіх абл. Доме нар. творчасці, упраўленні культуры, пам. нам. старшыні аблвыканкома. З 1980 дырэктар, з 1995 дырэктар-маст. кіраўнік Брэсцкага абл. т-ра лялек. Пры яго ўдзеле ў т-ры ўдала ўвасоблены на сцэне бел. драматург. творы Н.Мацяш, У.Ягоўдзіка, Г.Васілеўскай, Н.Тулупавай, У.Граўцова, І.Сідарука. З 1996 прэзідэнт Бел. цэнтра *УНІМА*. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў міжнар. фестывалю драм. і лялечных т-раў «Белая Вежа».

С.Ф.Юркевіч.

ША́ВЕЛЬ Сяргей Аляксандравіч (н. 17.10.1940, в. Геруцева Свіслацкага р-на Гродзенскай вобл.), бел. сацыёлаг і філосаф. Д-р сацыялагічных н. (1990), канд. філас. н. (1977). Скончыў Маскоўскі ун-т (1969). З 1969 у Ін-це філасофіі і права АН Беларусі. З 1970 у трэсце «Беларусмантажспецбуд». З 1974 у БДУ. З 1981 у Ін-це філасофіі і права, з 1990 заг. аддзела Ін-та сацыялогіі і сац. тэхналогій Нац. АН Беларусі (у 1991—93 нам. дырэктара). Навук. працы па праблемах сац. палітыкі, развіцця сац. сферы і сац. структуры грамадства, матывацыі і стымулявання працы і эканам. актыўнасці, тэорыі і методыкі сацыялагічных даследаванняў.

Тв.: Социальная сфера общества и личность. Мн., 1988; Социальная политика суверенной Беларуси. Мн., 1996 (разам з Р.А.Смірновай); Тенденции изменения социальной структуры Беларуси. Мн., 1996; Социальная структура, мобильность, идентификация. Мн., 1998 (разам з А.У.Рубанавым, Р.А.Смірновай); Трудовой коллектив и рынок: опыт социол. анализа. Мн., 1999 (разам з В.В.Бушчыкам); Политические элиты России и Белоруссии. М.; Мн., 2000 (у сааўт.).

ШАВІНІ́ЗМ (франц. chauvinisme), крайняя форма *нацыяналізму*, якая праяўляецца ў прапагандзе нац. і расавай выключнасці, распальванні нац. варожасці і суправаджаецца нац. *дыскрымінацыяй*. Тэрмін «Ш.» упершыню з'явіўся ў Францыі ў п'есе братоў І. і Т. Каньяр «Трохкаляровая кукарда» (1831), адзін з герояў якой навабранец Нікала Шавэн — фанатычны прыхільнік захопніцкіх паходаў Напалеона І. У Вялікабрытаніі ў 1870-я г. Ш. атрымаў назву джынгаізм. Адрозніваюць *сацыял-шавінізм* і вялікадзяржаўны Ш., звязаны звычайна з прыгнётам т.зв. «недзяржаўных», «нетытульных» нацый, «малых народаў» і нац. меншасцей, з агрэсіўнасцю і экспансіянізмам у адносінах да інш. народаў і краін. У аснове Ш. — перакананне яго прыхільнікаў у месіянскім прызначэнні асобных народаў, неабходнасці прывіцця інш. народам культуры і ладу жыцця свайго «выбранага» этнасу. У крайніх формах Ш. праявіўся

ў ідэалогіі і палітыцы *фашызму*, жывіць сучасным *расізм*. Наяўнасць прапагандысцкіх праграм-«прыкрыццяў» камуфлюе Ш. пад прымальную для ўсіх сац. і культ.-асв. ідэалогію, антыгуманізм якой выяўляецца толькі на позняй стадыі масавых псіхозаў і насілля (нацысцкі рух і інш.). На ўзроўні канкрэтнай паліт. практыкі Ш. вядзе да *генацыду* (яўрэяў і цыганоў у фаш. Германіі, армян у Турцыі ў 1915—16 і г.д.), этн. *дэпартацый*. *С.А.Яцкевіч.*

ШАВІ́НЬСКА (Szewińska; дзявочае Кіршэнштэйн) Ірэна (н. 24.5.1946, С.-Пецярбург), польская спартсменка (лёгкая атлетыка, бег). Чэмпіёнка XVIII, XIX і XXI Алімп. гульняў (1964, Токіо — у эстафеце 4 × 100 м; 1968, Мехіка — у бегу на 200 м; 1976, г. Манрэаль, Канада — у бегу на 400 м), сярэбраны прызёр (1964 — бег на 200 м і скачкі ў даўжыню), бронз. прызёр (1968 — бег на 100 м; 1972, на XX Алімп. гульнях, г. Мюнхен, Германія — бег на 200 м). Чэмпіёнка Еўропы (1965 — бег на 200 м, эстафета 4 × 100 м, скачкі ў даўжыню; 1974 — бег на 100 і 200 м), сярэбраны прызёр (1966 — бег на 100 м; 1971, у закрытых памяшканнях — скачкі ў даўжыню), бронз. прызёр (1971 — бег на 200 м; 1974 — эстафета 4 × 100 м; 1975, у закрытых памяшканнях — бег на 60 м; 1978 — бег на 400 м і эстафета 4 × 100 м). Рэкардсменка свету (1965—78) у бегу на 100, 200 і 400 м. З 1988 нам. старшыні Алімп. к-та Польшчы. *А.М.Петрыкаў.*

ША́ВУШКА, у рэлігіі і міфалогіі стараж. *хурытаў* багіня кахання і ўрадлівасці, сястра бога навальніцы Тэшуба. Адпавядала вавілона-асірыйскай багіні *Іштар*, з якой яе часта атаясамлівалі.

ШАВЫ́РЫН Барыс Іванавіч (10.5.1902, г. Яраслаўль, Расія — 9.10.1965), расійскі канструктар мінамётнага і рэактыўнага ўзбраення. Д-р тэхн. н. (1952). Герой Сац. Працы (1945). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча (1930). З 1932 ст. інжынер-канструктар, нач. канструктарскага бюро на шэрагу з-лаў. З 1942 нач. і гал. канструктар спец. канструктарскага бюро. У 1937—38 пад яго кіраўніцтвам створаны 50-мм, 82-мм, 107-мм мінамёты. У 1949—50 распрацаваны 160-мм і 240-мм мінамёты, шэраг інш. узораў зброі для арміі і флоту. Ленінская прэмія 1964. Дзярж. прэміі СССР 1942, 1950, 1951.

Літ.: Мартынчук Н.Н. Дело жизни. М., 1975. С. 42—48; Латухин А.Н. Минометы. М., 1970.

ШАВЯЛЁВІЧ Віктар Васілёвіч (н. 4.6.1946, г. Самарканд, Узбекістан), бел. рэжысёр кіно і тэлебачання. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1974). З 1968 на тэлебачанні. Паставіў фільмы: дакумент. «Вакаліз» (1971), «Крыніца» (1974, спец. прыз Міжнар. кінафестывалю ў Дубліне, 1974), «Тварам да вас» (1978, спец. прыз Міжнар. кінафестывалю ў Кане, 1979), «Стварэнне» (1980), «Бацькоўскі дом» (1982), «Хатынь» (1985), «Па дарогах «Слова аб паходзе Ігаравым» (1986), «Галасушка» (1989), «Адхланне» (1992), «Уладар» (1993), «Славянскія танцы», «Валянцінаў дзень» (абодва 1994), «Пад крыламі Ефрасінні» (1997, прэмія Міжнар. кінафестывалю «Залаты віцязь», Масква, 1997), «Дабро твары» (1998), «Час будаваць храмы» (2001); маст. «Прыйдзі і віждзь» (1992), «Пастка для зубра» (1994—95); фільмы-спектаклі «Пачакай, затрымайся» (1981), «Пагарэльцы» (1988), «Князь Вітаўт» (1998); фільмы-балеты «Карміна-Бурана» (1990), «Шчаўкунок» (1992), «Спартак» (1993), «Страсці» («Рагнеда», 1996) і інш. *В.А.Мядзведзева.*

ШАВЯЛЁВА Кацярына Васілеўна (13.1.1917, Масква — сакавік 1998), руская пісьменніца. Вучылася ў Літ. ін-це імя М.Горкага ў Маскве (1933—37). У 1940—43 працавала ў апараце ЦК ВЛКСМ, у 1948—51 у час. «Советская женщина», у 1964—76 у агенцтве друку «Навіны». Друкавалася з 1936. У кн. паэзіі «Лірыка» (1940), «Зямля родная» (1942), «Сустрэчы на гэтай планеце» (1962), «Усё залежыць ад вас!» (1972), «Касцёр на снезе» (1985) і інш. тэмы камсамольскага юнацтва, кахання, подзвігу народа ў Вял. Айч. вайну. Аўтар зб. навел «Будні ў Індыі» (1965), раманаў «Аляксандраўскі сад» (1976), «Хатні ачаг» (1983). У паэме «Камуніст» (у зб. «Радасць і гора», 1982) узнаўляе жыццёвы шлях П.М.Машэрава, яго памяці прысвяціла зб. вершаў «Расіянка» (1980). Неаднаразова бывала на Беларусі, ёй прысвяціла цыкл вершаў «Беларускі сшытак» (у зб. «Радасць і гора»). На бел. мову творы Ш. перакладалі Э.Агняцвет, К.Кірэенка, Ю.Свірка, Н.Тулупава, Я.Янішчыц і інш.

Тв.: Избранное. М., 1979; Бел. пер. — Аляксандраўскі сад. Мн., 1979; Зямная веліч: Вершы і паэма. Мн., 1982. *Г.Я.Адамовіч.*

ШАВЯЛУ́ХА Віктар Сцяпанавіч (н. 11.1.1929, с. Лялекаўка Пятроўскага р-на Кіраваградскай вобл., Украіна), бел. вучоны ў галіне фізіялогіі раслін; дзярж. дзеяч Беларусі. Д-р біял. н. (1972), праф. (1973). Скончыў Маскоўскую с.-г. акадэмію імя Ціміразева (1955). З 1958 на парт. і сав. рабоце ў Яраслаўскай вобл. З 1964 у БСГА (з 1972 заг. кафедры). З 1973 дырэктар і заг. аддзела Бел. НДІ земляробства. З 1974 сакратар і член Бюро ЦК КПБ. Дэп. Вярх. Савета БССР у 1975—80. З 1979 нам. міністра сельскай гаспадаркі СССР. З 1984 акадэмік-сакратар аддз. раслінаводства і селекцыі УАСГНІЛ. Навук. працы па вывучэнні заканамернасцей роставых і інш. фізіял. працэсаў у культ. раслін, павышэнні прадукцыйнасці збожжавых і інш. культур.

Тв.: Резервы хлебной нивы. Мн., 1978 (у сааўт.); Устойчивость зерновых к факторам среды. Мн., 1978 (у сааўт.); Периодичность роста сельскохозяйственных растений и пути ее регулирования. 2 изд. М., 1980.

ШАГА́Л (Chagall) Марк (Моўша Хацкелевіч, Майсей Захаравіч; 7?.7.1887, г. Віцебск — 28.3.1985), бел. і франц. мастак яўрэйскага паходжання. Ганаровы д-р ун-та ў г. Глазга (Вялікабрытанія; 1959). Вучыўся ў Віцебскай школе-майстэрні Ю.Пэна (1906), рысавальнай школе пры Т-ве заахвочвання мастацтваў (1907—08), прыватнай школе

М.Шагал.

М.С.Шагінян.

А.Звенцавай у Л.Бакста і М.Дабужынскага (1908—10) у Пецярбургу. Удзельнік выставак аб'яднанняў «*Асліны хвост*» (1912), «*Бубновы валет*» (1916), «*Свет мастацтва*» (1919, 1922). У 1910—14 жыў у Парыжы, дзе пад уплывам еўрап. авангардысцкіх кірункаў і рус. нар. мастацтва пісаў карціны, якім уласцівы рытмічная арганізацыя кампазіцыі, геаметрызаванасць аб'ёмаў, напружанасць і эмацыянальнасць колеру, часта дамінаванне яўр. рэліг. і фалькл. тэматыкі: «Я і мая вёска» (1911), «Расіі, аслам і іншым» (1911—12), «Аўтапартрэт з сямю пальцамі», «Яўрэй моліцца» (абодва 1912). З 1914 у Віцебску, з 1915 у Расіі. З 1918 паўнамоцны прадстаўнік па справах мастацтваў у Віцебскай губ., заснавальнік *Віцебскага народнага мастацкага вучылішча*. З 1920 у Маскве. У 1921—22 выкладаў у прац. калоніі «III Інтэрнацыянал» для беспрытулькаў у г.п. Малахаўка пад Масквой. У 1922 ці 1923 эмігрыраваў у Парыж, з 1941 у ЗША, у 1947 вярнуўся ў Францыю. Працаваў у жывапісе, станковай і кніжнай графіцы, тэатр.-дэкарацыйным, манум., дэкар.-прыкладным мастацтве, скульптуры. Асн. тэмы творчасці — сімвалічна асэнсаваныя, выяўленыя праз спалучэнне розначасовых і рознапрасторавых эпізодаў мантажу віды Віцебска, Парыжа, свет цырка, закаханыя, матывы іудзейскай містыкі: «Віцебск» (1908), «Стары Віцебск», «Блакітныя закаханыя» (абодва 1914), «Зялёныя закаханыя» (пасля 1914), «Ружовыя закаханыя», «Шэрыя закаханыя» (абодва 1916), «Сіні дом у Віцебску», «Шэры дом у Віцебску» (абодва 1917), «Над горадам» (1918), «Павянчаныя Эйфелевай вежай» (1928), «Стары горад» (1929), «Аголеная над Віцебскам» (1933), «У часу няма берагоў» (1939—41), «Масты Сены» (1953), «Каровы над Віцебскам»

(1966), «Анёл над Віцебскам» (1977), «Мастак над Віцебскам» (1977—78, варыянт 1982); серыя літаграфій «Успаміны аб Віцебску» (пач. 1960-х г.). Крыніца сюжэтаў для кампазіцый Ш. — яўр. местачковы побыт, трактаваны ў наіўна-паэт., гратэскна-сімвалічным, іранічна-фантаст. духу. Яны вылучаюцца жывапісным тэмпераментам, эмацыянальнасцю і пластычнай выразнасцю, сакавітым колерам і адначасова мяккім лірызмам. Аўтар партрэтаў: «Мяснік» («Партрэт дзеда», 1910), «Партрэт брата Давіда з мандалінай» (1914), «Бэла ў белым каўнерыку» (1917), «Вянчанне» (1918), аўтапартрэтаў; ілюстрацый да кніг «Мёртвыя душы» М.Гогаля (1923—27), «Байкі» Ж.Лафантэна (1925—30), Біблії (1930—39, 1952—56), «Тысяча і адна ноч» (1946), «Дафніс і Хлоя» Лонга (1952), вершаў А.Вазнясенскага (1969—70), «Бура» У.Шэкспіра (1975), «І на зямлі» А.Мальро (1977); сцэнаграфій балетаў «Алека» на музыку П.Чайкоўскага (1942), «Жар-птушка» І.Стравінскага (1945) у «Метраполітэн-опера» ў Нью-Йорку і інш. Працаваў у манум. мастацтве: размалёўкі плафонаў т-раў «Гранд-Апера» ў Парыжы (1963—64) і «Метраполітэн-опера» (1965—66), вітражы для Іерусалімскай клінікі (1962), Рэймскага сабора (1974), касцёла св. Стэфана ў г. Майнц (Германія, 1978—85), мазаікі для Нац. банка ў г. Чыкага (ЗША, 1972) і інш. Пісаў вершы. У г. Ніца (Францыя) створаны музей Ш., прысвечаны яго творам на біблейскія тэмы, у Віцебску — Дом-музей, Арт-цэнтр імя Ш., яму пастаўлены помнік (1992, скульпт. А.Гвоздзікаў). У 1994 і 1997 у Віцебску адбыліся 1-ы і 2-і Міжнар. пленэры Ш.

Тв.: Рус. пер. — Ангел над крышами: Стихи. Проза. Статьи. Выступления. Письма. М., 1989; Моя жизнь. СПб., 2000; Бел. пер. — Паэзія. Мн., 1989.

Літ.: Апчинская Н. Марк Шагал: Графика. М., 1990; Яеж. Марк Шагал: Портрет художника. М., 1995; Подлипский А. Марк Шагал: Основные даты жизни и творчества. 2 изд. Витебск, 2000; Ягож. Васильковые годы Марка Шагала, или Витебск в судьбе художника. Витебск, 1997; Meyer F. Marc Chagall: Life and work. New York, 1963.

М.Л.Цыбульскі.

ШАГАМЕ́Р, 1) прылада для вымярэння шагу *разьбы* (адлегласці паміж суседнімі аднайм. бакавымі старанамі яе профілю) або шагу цыліндрычных *зубчастых колаў* (адлегласці паміж аднайм. профілямі іх суседніх зубцоў). 2) Прылада ў выглядзе кішэннага гадзінніка, якая аўтаматычна адлічвае колькасць крокаў чалавека для прыблізнай ацэнкі пройдзенай ім адлегласці.



Накладны **шагамер** для кантролю шагу зубчастых колаў: 1 — кола, шаг якога вымяраецца; 2—4 — вымяральныя наканечнікі; 5 — двухбаковае вымяральнае прыстасаванне.

ШАГІНЯ́Н Альберт Сямёнавіч (14.7.1934, г. Армавір Краснадарскага краю, Расія — 20.8.2000), бел. вучоны ў галіне машынабудавання. Д-р тэхн. н. (1984), праф. (1988). Акад. Бел. (з 1992 віцэ-прэзідэнт) і Міжнар. інжынерных акадэмій. Засл. дз. нав. Беларусі (1985). Засл. вынаходнік Беларусі (1980). Скончыў ін-т с.-г. машынабудавання (г. Растоў-на-Доне, 1957). З 1957 на прадпрыемствах выпрабавальных машын (г. Армавір). З 1973 дырэктар — гал. канструктар Гомельскага СКБ сейсмічнай тэхнікі. З 1986 рэктар Гомельскага тэхн. ун-та. Навук. працы па тэорыі імпульсных і вібрацыйных крыніц сейсмічных сігналаў, распрацоўцы і ўкараненні сейсмаразведачнай і вымяральнай тэхнікі, тідраўлікі.

Тв.: Исследования несущей способности гидростатических опор высокоскоростных цилиндров вибростендов (разам з В.А.Буцько) // Трение и износ. 1996. Т. 17; №2; Бороться и искать... // Изв. Бел. инженерной академии. 1996. №1; Электрогидравлические усилители. Гомель, 2001 (разам з У.В.Балоцкім).

ШАГІНЯ́Н Марыэта Сяргееўна (2.4.1888, Масква — 20.3.1982), армянская і руская пісьменніца. Чл.-кар. АН Арменіі (1950). Герой Сац. Працы (1976). Д-р філал. н. (1945). Скончыла Вышэйшыя жан. курсы ў Маскве (1911). Друкавалася з 1903. Выдала зб-кі вершаў «Першыя сустрэчы» (1909), «Orientalia» (1913), раманы «Свой лёс» (1918, поўнае выд. 1923), «Прыгоды дамы са свецкіх колаў» (1923), аповесць «Перамена» (1922—23) пра інтэлігенцыю, аповесць «Уваскрэсенне з мёртвых» (1964) пра чэш. кампазітара І.Мыслівечака. Аўтар тэтралогіі пра У.І.Леніна («Сям'я Ульянавых», 1938, 1957; «Першая Усерасійская», 1965; «Білет па гісторыі», 1969; «Чатыры ўрокі ў Леніна», 1970), трылогіі «Мес-Менд» (1924, аднайм. кінафільм 1926). Пісала нарысы: «Урал у абароне» (1944), «Па дарогах пяцігодкі» (1947), «Падарожжа па Савецкай Арменіі» (1950), «Замежныя пісьмы» (1964); літ.-знаўчыя працы: «Тарас Шаўчэнка» (1941), «Эцюды пра Нізамі» (1947), «Гётэ» (1950); успаміны «Чалавек і час» (1971—78) і інш. Дзярж. прэмія СССР 1951. Ленінская прэмія 1972.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—9. М., 1971—75.

Літ.: Творчество Мариэтты Шагинян: [Сб. ст.]. Л., 1980; Скорино Л.И. Мариэтта Шагинян — художник. 2 изд. М., 1981.

ШАГ-НАВАЖЫ́ЛАЎ (сапр. Наважылаў) Анатоль Сяргеевіч (н. 21.11.1910, г. Выбарг, Расія), расійскі і бел. артыст цырка, ілюзіяніст. Засл. арт. Беларусі (1963). У цырку з 1927. Выступаў як акрабат-эксцэнтрык, муз. эксцэнтрык, клоун-дыванові. У 1930 займаўся маніпуляцыяй, з 1932 ствараў ілюзійныя нумары. Выступаў пад псеўд. Шаг. Сярод работ: «Калі заўтра вайна» (1937), «Перамога» (1946), «На цыркавой і міжнароднай арэне» (1951), «Чараўнік Ягорыч» (1956), «Руслан і Людміла» (1979). У 1960—67 кіраўнік Бел. цыркавога калектыву, дзе стварыў новы ілюзійна-трансфармацыйны атракцыён у праграме «Бывайце здаровы!». Выступаў з бел. калектывам у шапіто Гомеля, Бабруйска, Магілёва, Віцебска. Аўтар сюжэтаў і канструктар апаратуры большасці сваіх нумароў. З 1967 рэжысёр «Саюздзяржцырка». У 1969 пакінуў манеж.

Тв.: Былое не исчезает. М., 1997; Меченый циркач. М., 1999; Цирк, война и любовь. М., 2003.

М.Шагал. Над горадам. 1918.

ШАГУ́Н Георгій Іосіфавіч (парт. псеўд. Максімаў; 5.10.1903, в. Пузевічы, цяпер в. Партызанская Гродзенскага р-на — 13.9.1960), дзеяч рэв. руху ў Зах. Беларусі. Скончыў Мінскую школу КПЗБ (1925). З 1922 на падп. парт. рабоце ў Зах. Беларусі: чл. і сакратар Скідзельскага раённага, чл. Гродзенскага, сакратар Баранавіцкага, Пінскага і Беластоцкага акр. к-таў КПЗБ. На III канфер. КПЗБ (1926) выбраны чл. ЦК. За рэв. дзейнасць у 1927 арыштаваны польскімі ўладамі і зняволены на 8 гадоў. Пасля вызвалення з турмы на падп. рабоце. Адзін з арганізатараў Скідзельскага паўстання 1939. Дэп. Нар. сходу Зах. Беларусі (кастр. 1939, Беласток). Да чэрв. 1941 заг. аддзела Скідзельскага райвыканкома. Удзельнік Вял. Айч. вайны. З 1945 на сав. і гасп. рабоце ў г. Скідзель.

ША́ДАЎ (Schadow), сям'я нямецкіх мастакоў канца 18—19 ст.; бацька і сын. Нарадзіліся ў Берліне.

Іаган Готфрыд (20.5.1764—27.1.1850), скульптар; прадстаўнік класіцызму. Вучыўся ў Берліне, Рыме (1785—87). З 1788 кіраваў прыдворнай скульпт. майстэрняй у Берліне. З 1805 віцэ-дырэктар, з 1815 дырэктар Берлінскай АМ. Творы вылучаюцца пластычнай і эмацыянальнай раскаванасцю (квадрыга з фігурай Перамогі на Брандэнбургскіх варотах у Берліне, 1788—94), часам індывідуалізацыяй вобразаў («Кронпрынцэса Луіза і прынцэса Фрэдэрыка», 1795—97). Вядомы таксама як графік і тэарэтык мастацтва. Фрыдрых Вільгельм (6.9.1788—19.3.1862), сын Іагана Готфрыда, жывапісец-рамантык; адзін з заснавальнікаў *Дзюсельдорфскай школы жывапісу*. Неаднаразова наведваў Рым (выканаў фрэскі на сюжэты легенды пра Іосіфа ў доме Бартольдзі, 1816—17). З 1819 праф. Берлінскай АМ, у 1826—59 дырэктар АМ у Дзюсельдорфе.

ШАДР (сапр. Іваноў) Іван Дзмітрыевіч (11.2.1887, г. Шадрынск Курганскай вобл., Расія — 3.4.1941), расійскі скульптар. Вучыўся ў маст.-прамысл. школе ў Екацярынбургу (1903—07), у рысавальнай школе Т-ва заахвочвання мастацтваў у С.-Пецярбургу (1907—08), у Парыжы (1910—11), Рыме (1911—12). Чл. Т-ва рус. скульптараў (з 1926). Удзельнічаў у рэалізацыі плана манум. прапаганды. Раннія творы (праект помніка «Сусветнай пакуце», 1915) маюць рысы стылю мадэрн. З 1920-х г. яго творам уласцівы рамант. трактоўка вобразаў, выразнасць індывід. характарыстык, абагульненасць, прасякнутая пафасам сац. пераўтварэнняў: «Чырвонаармеец», «Рабочы», «Сейбіт», «Селянін» (усе 1922), «Камень — зброя пралетарыяту» (1927). Аўтар помнікаў У.Леніну на Зема-Аўчальскай ГЭС (Грузія, 1927), М.Горкаму ў Маскве (1939, ажыццёўлены В.Мухінай, З.Івановай і Н.Зяленскай у 1951), партрэтаў.

Літ.: Воронова О. Шадр. М., 1969; Шадр: Лит. наследие. Переписка. Воспоминания о скульпторе. М., 1978.

І.Г.**Шадаў**. Кронпрынцэса Луіза і прынцэса Фрэдэрыка. 1795—97.

І.**Шадр**. Камень — зброя пралетарыяту. 1927.

ШАДУ́РСКІ Канстанцін Станіслававіч (31.3.1912, г. Куйбышаў Новасібірскай вобл.. Расія — 12.1.1983), расійскі і бел. вучоны ў галіне фармакалогіі. Д-р мед. н., праф. (1948). Скончыў Томскі мед. ін-т (1933). Працаваў у Томску (1933—41). Яраслаўлі (1947—52), Обнінску (1963—72). У 1953—63 заг. кафедры Мінскага мед. ін-та, Бел. ін-та ўдасканалення ўрачоў (1973—75). З 1973 адначасова кансультант НДІ мед. радыялогіі АМН СССР у Обнінску. Навук. працы па даследаванні і ўкараненні новых лек. сродкаў для лячэння глаўкомы, гіпертанічнай хваробы і інш. Даследаваў пытанні прамысл. і с.-г. таксікалогіі. Дзярж. прэмія СССР 1975.

Тв.: Лекции по общей фармакологии. 3 изд. Мн., 1961; Фармакология. Мн., 1963 (у сааўт.).

ШАДУ́РСКІ (Szadurski) Станіслаў (18.9.1726, каля г. Даўгаўпілс, Латвія — 1789), бел. і польскі філосаф. Вучыўся ў езуіцкіх калегіумах Вільні і Оршы. Выкладаў грэч. і лац. мовы ў Вільні і Варшаве. У 1752 накіраваны Віленскім ун-там у Парыж вывучаць тэалогію, філасофію, прыродазнаўства і матэматыку. З 1757 выкладаў філасофію ў Варшаўскім шляхецкім калегіуме, у 1759—62 праф. філасофіі Навагрудскага калегіума. У навагрудскі перыяд напісаў і апублікаваў свае найб. значныя філас. творы. Асн. працы — «Прынцыпы філасофіі мыслення і адчування» (1758), «Зачаткі разважанняў у розных дыялогах, а таксама практыкаванняў па логіцы, этыцы і метафізіцы» (1760), «Філасофскія азначэнні агульнай фізікі, выказаныя публічна аўтарам» (1761), «Фізіка, або Філасофія прыроды» (не апубл.). У 1762—65 прыдворны капелан мінскага ваяводы, праф. тэалогіі і царк. права ў Гродне (1768—70) і Браневе (1770—71). Паводле Ш., у тэорыі пазнання неабходна гарманічна спалучаць рацыяналізм і эмпірызм, а гал. крытэрыем ісціны павінна быць відавочнасць; пры гэтым ён не адмаўляў ролю гіст. аўтарытэту, веры і думкі. У галіне фармальнай логікі Ш. разглядаў традыц. для схаластыкі аперацыі розуму (паняцце, суджэнне і вывад), пытанні тэорыі дэдуктыўнага разважання (*сілагістыка*), *семантыкі лагічнай* і аналогіі выказванняў. Як прыхільнік эклектычнай філасофіі, лічыў магчымым карыстацца рознымі філас. сістэмамі і запазычваць з іх тое, што ўяўлялася яму дакладным і не выклікала сумнення. У вырашэнні праблемы суадносін матэрыі і свядомасці падзяляў дуалізм Р.Дэкарта, адначасова спрабаваў аб'яднаць яго вучэнне аб прыроджаных ідэях са схаластычным палажэннем аб інтэлектуальным пазнанні. Асаблівай увагі заслугоўваюць яго рацыянальна-эмпірычны погляд на прыродазнаўства, спробы вытлумачыць рэліг. догматы з дапамогай законаў механікі, дынамікі, статыкі, оптыкі і інш.

Тв.: Философские положения по общей физике // Памятники философской мысли Белоруссии XVII — первой половины XVIII в. Мн., 1991.

Літ.: Бирало А.А. Философская и общественная мысль в Белоруссии и Литве в конце XVII — середине XVIII в. Мн., 1971; Цукерман А.Я. Философская мысль в Белоруссии середины XVIII в. Мн., 1980; Ас-

ветнікі зямлі Беларускай: Энцыкл. давед. Мн., 2001. *С.Ф.Дубянецкі.*

ШАДЫ́РА Алег Іосіфавіч (н. 31.3.1948, в. Даўгінава Вілейскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне радыяцыйнай хіміі і хіміі свабодных радыкалаў. Д-р хім. н. (1988), праф. (1997). Брат В.І.*Шадыры*. Скончыў БДУ (1971), дзе і працуе (з 1991 заг. лабараторыі, адначасова ў 1994—95 дэкан хімфака, з 1994 заг. кафедры). Навук. працы па даследаванні радыяцыйна індуцыраваных свабоднарадыкальных ператварэнняў біялагічна актыўных рэчываў і стварэнні на гэтай аснове метадаў накіраванага пошуку фармакалагічна актыўных злучэнняў.

Тв.: Радиационная химия бифункциональных органических соединений. Мн., 1986 (разам з Я.П.Пятраевым); Гомологические ряды изменчивости в биологии и химии. Мн., 1987; Radiation-induced peroxidation and fragmentation of lipids in a model membrane (у сааўт.) // International journal of radiation biology. 2002. Vol. 78, № 3. *П.М.Бараноўскі.*

ШАДЫ́РА Вадзім Іосіфавіч (н. 1.3.1947, г. Пячора, Рэспубліка Комі, Расія), бел. археолаг. Д-р гіст. н. (2003). Брат А.І.*Шадыры*. Скончыў БДУ (1972). З 1974 у Ін-це гісторыі Нац. АН Беларусі (з 1991 заг. аддзела археалогіі жал. веку). Вывучае жал. век басейна Зах. Дзвіны і этнакультурныя працэсы 1-га тыс. н. э. Адкрыў і даследаваў шэраг помнікаў ранняга жал. веку на Пн Беларусі. Прытрымліваецца думкі пра балцкую прыналежнасць асн. культур ранняга жал. веку на тэр. Беларусі. Адзін з аўтараў 4-томнай працы «Археалогія Беларусі» (т. 2, 1999).

Тв.: Ранний железный век северной Белоруссии. Мн., 1985; Да пытання аб ролі еўрапейскіх этнакультурных працэсаў I тыс. н.э. ў этнагенезе беларусаў // Славяне и их соседи: (Археология, нумизматика, этнология). Мн., 1998; Белорусско-литовско-латышское порубежье в эпоху железного века и раннего средневековья: (этнокультурные аспекты) // Is baltų kultūros istorijos. Vilnius, 2000. *Т.С.Скрыпчанка.*

ШАЗА́Р Шнеўр Залман (сапр. Р у б а ш а ў Залман; 1889, г.п. Мір Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл. — 1974), дзяржаўны і паліт. дзеяч Ізраіля, пісьменнік і гісторык л-ры. З сям'і прыхільнікаў *хасідызму*. Атрымаў традыц. яўр. адукацыю, вучыўся на Вышэйшых курсах усходазнаўства (Пецярбург), у Страсбурскім і Берлінскім ун-тах (1912—17). У юнацтве прыхільнік руху *Паалей Цыён*, з 1907 адзін з лідэраў сіянісцкага руху ў Вільні, з 1912 у Германіі. У 1917—20 у складзе Камісіі па вывучэнні эканам. становішча ў Палесціне распрацоўваў план гасп. развіцця будучай яўр. дзяржавы. З 1924 жыў у Палесціне, удзельнічаў у яўр. прафс. і нац.-вызв. руху. Чл. дэлегацыі Яўр. агенцтва (Сахнут) на Ген. Асамблеі ААН 1947. Пасля абвяшчэння дзяржавы Ізраіль (14.5.1948) дэп. яе парламента (кнесета, з 1949), міністр адукацыі і культуры (1949—51). У 1956—60 старшыня Іерусалімскага выканкома *Сусветнай сіянісцкай арганізацыі*. У 1963—73 прэзідэнт Ізраіля. Аўтар гіст.-літ. зб-каў «Гісторыя біблейскай крытыкі» (1925), «Светачы» (1963), аўтабіягр. нарысаў «Перадсвітальныя зоркі» (1949) і інш. *І.П.Герасімава.*

ШАІ́НСКІ Уладзімір Якаўлевіч (н. 12.12.1925, Кіеў), расійскі кампазітар. Засл. дз. маст. Расіі (1978). Нар. арт. Расіі (1986). Скончыў Маскоўскую (1949) і Азерб. (1965) кансерваторыі. У 1949—52 скрыпач Дзярж. аркестра Расіі пад кіраўніцтвам Л.Уцёсава. Аўтар папулярных песень «Дразды», «Не плач, дзяўчынка», «Травы, травы», «Усмешка», «Блакітны вагон» і інш. Дзярж. прэмія СССР 1981.

ШАЙБА́К Міраслаў (сапр. А д а м ч ы к Міраслаў Вячаслававіч; н. 6.8.1965, Мінск), бел. пісьменнік. Скончыў БДУ (1990). З 1989 у час. «Бярозка», «Беларусь», з 1991 у выд-ве «Літаратура». Друкуецца з 1983. Аўтар дэтэктыўнай аповесці «Забойства на Каляды» (1991), рамана-трылера «Каханка д'ябла, або Карона Вітаўта Вялікага» (1991, з М.Клімковічам), а таксама сааўтар п'ес і інш.

ШАЙБАНІ́ДАЎ ДЗЯРЖА́ВА, Ш э й б а н і д а ў д з я р ж а в а, дзяржава ў Сярэдняй Азіі ў 1500—98 на чале з дынастыяй *Шайбанідаў*. Яе сталіцай напачатку быў г. Самарканд, з 1560 — Бухара. Заснаванне Ш.дз. звязана з прыходам у Сярэднюю Азію качэўнікаў-узбекаў на чале з Шайбані-ханам і заваяваннем імі цэнтр. *Мавераначра*. Уключала ўсю б. дзяржаву *Цімурыдаў*. У 1510 распалася на 2 узб. дзяржавы: уласна Ш.дз. ў Мавераначры і *Хівінскае ханства*; былыя харасанскія ўладанні Цімурыдаў адышлі Ірану. Ш. дз. была падзелена на ўдзелы (замацоўваліся за членамі дынастыі), найбуйнейшыя з іх Бухара, Самарканд, Ташкент, Балх, Хісар. Шматлікія паходы і набегі на Харасан і бесперапынныя міжусобіцы разбуралі гаспадарку дзяржавы, нават стабілізацыя ў часы праўлення *Абдулы-хана II* не здолела ліквідаваць іх вынікі. Мела эканам. і дыпламат. адносіны з Расіяй і дзяржавай Вял. Маголаў у Індыі. У час існавання Ш.дз. за цюркамоўным насельніцтвам Мавераначра і Харасана замацаваўся этнонім *узбекі*. Высокага ўзроўню дасягнула культура.

ШАЙБАНІ́ДЫ, Ш э й б а н і д ы, дынастыя узбекскіх ханаў, нашчадкаў Шэйбана (Шыбана) — унука *Джучы*, брата *Батыя*. Заснавальнік — Мухамед Шайбані [1451—1510], які ў 1500—01 адваяваў у *Цімурыдаў* іх сталіцу Самарканд і засн. *Шайбанідаў дзяржаву*, устанавіў сваю ўладу над усім *Мавераначрам* і Харасанам. У 1508—09 Шайбані-хан здзейсніў паход на казахаў, у 1510 разбіты пад Мервам іран. шахам Ісмаілам I Сефевідам і забіты. У 1510—30 правіў Кучкунджы-хан, у 1530—33 — яго сын Абусаід, у 1533—39 — Убайдула-хан I. Пры *Абдуле-хане II* [1583—98] узмацнілася ханская ўлада і значна пашырылася тэрыторыя. Ш. лічылі толькі сябе законнымі наследнікамі Цімурыдаў і ўвесь час ваявалі з Сефевідамі за Харасан і другую сталіцу Цімурыдаў — Герат. Пасля смерці Абдулы-хана і забойства яго сына Абдал-Муміна дынастыя Ш. перастала існаваць. У 1599 да ўлады прыйшлі Джаніды.

Літ.: Босворт К.Э. Мусульманские династии: Справ. по хронологии и генеалогии: Пер. с англ. М., 1971. С. 207—208.

В.Шайнка.

І.П.Шайко.

ШАЙІ́НКА (Ṣoyinka) Воле (сапр. імя Акінвандэ Алуволе; н. 13.7.1934, г. Абеокута, Нігерыя), нігерыйскі пісьменнік, тэатр. дзеяч. Вучыўся ў Ібаданскім ун-це (1952—54), ва ун-це г. Лідс (Вялікабрытанія). Стваральнік і маст. кіраўнік тэатр. труп «Маскі-1960» і «Орысан». У 1975—85 праф. ун-та г. Іфе, з 1985 жыве ў Парыжы. Пачынаў як драматург і акцёр. Піша на мовах англ. і йоруба. У сац.-крытычных п'есах «Леў і жамчужына», «Насельнікі дрыгвы» (абедзве 1958), «Танец лесу» (паст. 1960), «Жніво Конгі» (1967), «Вар'яты і спецыялісты» (1971), «Смерць і стайневы кароль» (1975), «Гульня волатаў» (1984), «Рэквіем для футурыста» (1985) і інш. сутыкненне традыц. афр. мінулага з сучаснасцю. У рамане «Інтэрпрэтатары» (1965) своеасаблівая атмасфера нігерыйскага адукаванага грамадства, уплыў на яго еўрап. культуры і нац. традыцый, карупцыя сярод чыноўнікаў. Аўтар рамана «Час беззаконня» (1973), зб-каў вершаў «Ідандрэ» і іншыя вершы» (1967), «Чаўнок у цямніцы» (1972) і інш. У аўтабіягр. аповесці «Аке, гады дзяцінства» (1981) матывы і сюжэты афр. фальклору. Нобелеўская прэмія 1986.

Тв.: Рус. пер. — [Избранное]. М., 1987.

Літ.: Б е й л и с В.А. Воле Шойинка. М., 1977; Ш у п а С. Трыумф афрыканскай культуры // Далягляды, 88. Мн., 1988. *Л.П.Баршчэўскі.*

ШАЙКО́ Іван Паўлавіч (н. 10.2.1948, в. Шэйкі Клецкага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне жывёлагадоўлі. Акад. Нац. АН (2003) і Агр. АН Белару-

сі (1996, чл.-кар. 1992). Замежны чл. Рас. акадэміі с.-г. навук (2000). Д-р с.-г. н. (1987), праф. (1991). Засл. дз. нав. Беларусі (1998). Скончыў БСГА (1971). З 1975 у Бел. НДІ жывёлагадоўлі (з 1996 дырэктар). Навук. працы па распрацоўцы і выкарыстанні біятэхнал. метадаў паскоранага развядзення высокакаштоўных генатыпаў і атрыманні высокапрадукц. гібрыдаў і кросаў; стварэнні селекцыйных статкаў высокапрадукц. с.-г. жывёл. Аўтар і кіраўнік прац па вывядзенні бел. мясной *чорна-пярэстай пароды* свіней; удзельнічаў у вывядзенні бел. *чорна-пярэстай пароды* буйн. раг. жывёлы.

Тв.: Программа интенсификации свиноводства и рекомендации по ее реализации. М., 1989; Биотехнология свиноводства. Мн., 1993 (разам з У.С.Смірновым, У.В.Горыным); Свиноводство. Мн., 1998 (разам з У.С.Смірновым); Система ведения молочного скотоводства Республики Беларусь. Мн., 2002 (у сааўт.).

ШАЙКО́Ў Раман Міхайлавіч (н. 2.10.1950, Мінск), бел. спартсмен (суднамадэльны спорт, радыёкіроўныя гоначныя мадэлі). Майстар спорту СССР міжнар. класа (1978). Сярэбраны прызёр чэмпіянатаў свету (1979, г. Дуйсбург, ФРГ; 1998, г. Курвіль, Францыя). Чэмпіён Еўропы (1977, Кіеў). Чэмпіён СССР (1976, 1978 — 2-разовы, 1981, 1982, 1984, 1987 — 2-разовы). Рэкардсмен свету, Еўропы, СССР. У 1980—91 інструктар па спорце Цэнтр. к-та добраахвотнага т-ва садзейнічання арміі і флоту СССР. З 1993 кіраўнік суднамадэльнага гуртка Рэсп. цэнтра тэхн. творчасці вучняў (Мінск).

ШАЙКО́ЎСКІ Лазар Рыгоравіч (9.5.1901, г. Гродна — 3.1.1982), дзеяч рэв. руху ў Зах. Беларусі. Вучыўся ў аспірантуры Камуніст. ун-та нац. меншасцей Захаду ў Маскве (1933—35). З 1924 на падп. рабоце ў Зах. Беларусі: сакратар Гродзенскага, Брэсцкага гаркомаў КПЗБ. У 1926—28 чл. ЦК КПЗБ, кіраўнік ваен. і арганізац. аддзелаў ЦК КПЗБ. За рэв. дзейнасць у 1923 і 1927 арыштаваны польск. ўладамі, на *палітычным працэсе* 35-і (крас. 1929, Беласток) засуджаны на 15 гадоў зняволення. Дэп. Нар. сходу Зах. Беларусі (кастр. 1939, Беласток). Удзельнік Вял. Айч. вайны. У 1945—57 на сав. рабоце ў Гродне.

ШАЙМІЕЎ Мінтымер Шарыпавіч (н. 20.1.1937, в. Анякава, Татарстан, Расія), дзяржаўны і паліт. дзеяч Рэспублікі Татарстан (Расія). Скончыў Казанскі с.-г. ін-т. З 1959 працаваў інжынерам у сельскай гаспадарцы. З 1967 на парт. рабоце. Міністр меліярацыі і воднай гаспадаркі (1969—83), 1-ы нам. старшыні СМ (май—ліст. 1983) Тат. АССР; сакратар Тат. абкома КПСС (1983—85); старшыня СМ Тат. АССР (1985—89); 1-ы сакратар Тат. абкома КПСС (1989—90); старшыня Вярх. Савета Тат. АССР (1990—91). З чэрв. 1991 прэзідэнт Рэспублікі Татарстан (перавыбраны ў 1996 і 2001).

ШАЙН Рыгор Абрамавіч (19.4.1892, г. Адэса, Украіна — 4.8.1956), савецкі астрафізік. Акад. АН СССР (1939). Скончыў Тартускі ун-т (1919). З 1921 у Пулкаўскай абсерваторыі, з 1925 у яе Сімеізскім аддз., у 1945—52 дырэктар Крымскай астрафіз. абсерваторыі. Навук. працы па зорнай спектраскапіі і фізіцы газавых туманнасцей. Адкрыў каля 150 туманнасцей, камету, анамальную колькасць ізатопа ^{13}C у атмасферы зорак. Устанавіў (з амер. астраномам О.Струвэ) хуткае вярчэнне зорак ранніх спектральных класаў і вызначыў яго скорасць (1929). Даследаваў таксама малыя планеты, метэорныя патокі, сонечную карону. Дзярж. прэмія СССР 1950.

Тв.: Атлас диффузных газовых туманностей. М., 1952 (разам з В.Ф.Газе).

Літ.: Пикельнер С.Б. Г.А.Шайн (1892—1956) // Историко-астрономические исследования. М., 1957. Вып. 3.

ША́ЙЦЕРАВА, вёска ў Верхнядзвінскім р-не Віцебскай вобл., на аўтадарозе Верхнядзвінск—Полацк. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 12 км на ПдУ ад горада і 15 км ад чыг. ст. Верхнядзвінск, 163 км ад Віцебска. 591 ж., 222 двары (2003). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ШАКАЛА́Д (ад ісп. chocolate), кандытарскі выраб, які атрымліваюць перапрацоўкай насення *какавы*. Здаўна быў вядомы ў Мексіцы як напітак, у 16 ст. завезены ў Еўропу. Адрозніваюць натуральны Ш. (змяшчае толькі какава-прадукты і цукар) і Ш. з дабаўкамі (сухое малако, кава, арэхі, ванілін, каньяк і інш. харч. кампаненты). Ш. мае ў сабе цукру да 55%, тлушчаў (*какава-алей*) да 40%, таксама алкалоіды тэабрамін і кафеін. Энергет. каштоўнасць 2100—2500 кДж.

ШАКАЛА́ДНАЕ ДРЭ́ВА, кветкавая расліна; тое, што *какава*.

ШАКА́ЛЫ (Canis), млекакормячыя жывёлы роду ваўкоў сям. воўчых атр. драпежных. 4 віды Ш.: азіяцкі, ці звычайны (C. aureus), паласаты (C. adustus), чапрачны (C. mesomelas), эфіопскі (C. simensis). Пашыраны ў Паўд.-Усх. Еўропе, Паўд., Цэнтр. і Пярэдняй Азіі, Паўн. Амерыцы, Усх. і Паўд. Афрыцы. Жывуць ў зарасніках, часта каля населеных пунктаў. Эфіопскі Ш. занесены ў Чырв. кнігу МСАП.

Даўж. цела да 85 см, хваста — да 36 см, маса да 13 кг. Падобныя на *ваўка*, але драбнейшыя, з карацейшым хвастом і вузкай, завостранай мордай. Ногі тонкія, вушы стаячыя, злёгку закругленыя. Хвост кароткі, тоўсты і пушысты. Нараджае 4—9 шчанят. Амаль усёедныя, кормяцца грызунамі, птушкамі, змеямі, мярцвячынай, пладамі, ягадамі. Шкодзяць паляўнічай гаспадарцы.

Э.Р.Самусенка.

Ю.М.Шакальскі.

Л.М.Шакун.

ШАКА́ЛЬСКАГА ПРАЛІ́Ў. У архіпелагу Паўн. Зямля, паміж а-вамі Бальшавік і Кастр. Рэвалюцыі. Злучае моры Карскае і Лапцевых. Даўж. 106 км, шыр. 19—56 км, найменшая глыб. на фарватэры 55 м. Берагі абрывістыя, укрыты ледавікамі, ад якіх аддзяляюцца айсбергі. Б.ч. года ўкрыты лёдам. Названы ў гонар Ю.М.*Шакальскага*.

ШАКА́ЛЬСКІ Юлій Міхайлавіч (17.10.1856, С.-Пецярбург — 26.3.1940), расійскі географ, акіянограф і картограф. Ганаровы чл. АН СССР (1939, чл.-кар. з 1923). Скончыў Марскую акадэмію (1880). Працаваў у Гал. гідраграфічным упраўленні і Гал. фіз. абсерваторыі. Праф. Ваенна-марской акадэміі (1910—30) і Ленінградскага ун-та (1925—40). З 1914 віцэ-старшыня Рус. геагр. т-ва, у 1917—31 прэзідэнт Геагр. т-ва СССР. Вывучаў пытанні метэаралогіі, гідралогіі і акіянаграфіі, асваення Паўн. марскога шляху. Даследаваў Ладажскае воз., рэкі Вычэгда і Таўда. У

Шакалы: 1 — чапрачны, 2 — азіяцкі, ці звычайны.

1923—27 кіраваў акіянаграфічнай экспедыцыяй па комплексным вывучэнні Чорнага мора. Складальнік геагр. і спец. карт, рэдактар шэрагу атласаў. Яго імем названы в-аў у Карскім м., пралівы паміж а-вамі Паўн. Зямлі і ў Антарктыцы каля Зямлі Аляксандра I, некалькі ледавікоў і інш.

Тв.: Физическая океанография. Л., 1933; Океанография. 2 изд. Л., 1959.

Літ.: Андреева Е.В. Ю.М.Шокальский — океанограф, метеоролог, географ. 2 изд. Л., 1956; Орлов Б.П. Ю.М.Шокальский, его жизнь и деятельность. М., 1956.

ШАКІ́НКА Леанід Ісідаравіч (18.5.1927, в. Старына Лёзненскага р-на Віцебскай



Л.**Шакінка**. Капернік. 1973.

вобл. — 15.9.1996), бел. графік. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1962). У 1966—87 маст. рэдактар час. «Нёман». Працаваў у станковай і кніжнай графіцы. Творы вылучаюцца строгасцю і прастатой вырашэння: «У нас у двары» (1963), «Маці. 1941 год» (1964), «Дарога на Мінскае мора» (1965), «Залатая восень» (1966), «Коміны Хатыні» (1967), «Капернік», «Зімовыя карункі» (абодва 1973), партрэт Героя Сав. Саюза А.Ф.Данукалава (1985), серыі «Нашы маці» (1982), «Вайна і людзі» (1984), «Памяці воінаў-афганцаў» (1989—95). Афарміў кнігі В.Вольскага, І.Буніна і інш. *Л.Ф.Салавей.*

ШАКУ́Н Леў Міхайлавіч (14.9.1926, в. Браткава Капыльскага р-на Мінскай вобл. — 6.11.1996), бел. мовазнавец. Д-р філал. н. (1966), праф. (1967). Засл. работнік вышэйшай школы Беларусі (1979). Скончыў БДУ (1950), з 1953 працаваў у ім (з 1967 заг. кафедры). Даследаваў праблемы развіцця бел. літ. мовы, гісторыі бел. мовазнаўства, словаўтварэння і выкладання бел. мовы ў ВНУ. Аўтар «Нарысаў гісторыі беларускай літаратурнай мовы» (1960), «Марфемнага слоўніка беларускай мовы» (1975, з А.М.Бардовічам), падручніка «Гісторыя беларускай літаратурнай мовы» (2-е выд., 1984), вучэбных дапаможнікаў і інш. Дзярж. прэмія Беларусі 1986.

Тв.: Станаўленне і развіццё беларускай літаратурнай мовы. Мн., 1959; Кароткі агляд развіцця беларускага мовазнаўства // Беларускае мовазнаўства: Бібліягр. ўказ. (1825—1965 гг.). Мн., 1967; Карані роднай мовы: Выбр. працы па гісторыі бел. мовы. Мн., 2001.

Літ.: Красней В.П., Плотнікаў Б.А., Трайкоўская В.П. Прафесар Л.М.Шакун. Мн., 1997.

ШАКУ́РАЎ Сяргей Каюмавіч (н. 1.1.1941, Масква), расійскі акцёр. Нар. арт. Расіі (1991). Скончыў тэатр. вучылішча пры Цэнтр. дзіцячым т-ры (1964). Працаваў у т-рах Масквы, у 1978—87 у драм. т-ры імя Станіслаўскага. Акцёр адкрытага тэмпераменту, яго ігра адметная псіхал. глыбінёй, драм. напружанасцю. Сярод роляў: Аляксандраў («Жывы труп» Л.Талстога), Іванаў («Іванаў і іншыя» паводле А.Чэхава), Арбенін («Маскарад» М.Лермантава), Сірано («Сірано дэ Бержэрак» Э.Растана), Гамлет («Гамлет» У.Шэкспіра), Ён («Маналог пра шлюб» Э.Радзінскага), Сяргей Нячаеў, Трушнікаў («Не быў..., не знаходзіўся..., не ўдзельнічаў...», «Партрэт для першай паласы» Ю.Макарава) і інш. З 1967 здымаецца ў кіно: «Свой сярод чужых, чужы сярод сваіх» (1974), «Сібірыяда», «Смак хлеба» (абодва 1979), «Ратаўнік» (1980), «Армавір!», «Божае стварэнне» (абодва 1991), «Эскадрон» (1992), «Адзін пасярэдзіне Расіі» (1994), «Журавіны ў цукры» (1995), «Пан Тадэвуш» (1999), «Тайны палацавых пераваротаў» (2000), «Дзікунка» (2001) і інш. Дзярж. прэмія СССР 1980.

Літ.: Закржевская Л. С.Шакуров. М., 1982.

ША́К'Я, Сак'я, старажытнаіндыйская алігархічная рэспубліка і племя на тэр. непальскіх тэраяў. Сталіца — г. Капілавасту. У 6 ст. да н.э. трапіла ў залежнасць ад Кашалы. Паводле падання, амаль усё племя Ш. было знішчана царом Кашалы Відудабхай. Да племя Ш. належаў заснавальнік *будызму* інд. прынц Сідхартха Гаўтама, прызваны *Шак'ямуні*. Першыя яго паслядоўнікі, выхадцы з Ш., склалі пач. ядро будыйскай манаскай абшчыны, таму будыйскіх манахаў таксама наз. Ш.

ШАК'ЯМУ́НІ (санскр. — пустэльнік з племя шак'я; уласнае імя Сідхартха, родавае — Гаўтама), у будысцкай міфалогіі апошні зямны *будда*, які, паводле падання, жыў у Індыі ў 623—544 да н.э. і лічыцца заснавальнікам *будызму*.

ШАЛАЁЎКА, вёска ў Кіраўскім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр Грыбавецкага с/с і калгаса. За 26 км на ПнУ ад г.п. Кіраўск, 62 км ад Магілёва, 31 км ад

чыг. ст. Нясета. 194 ж., 79 двароў (2003). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ШАЛА́К Міхаіл Уладзіміравіч (н. 7.6.1941, в. Зарніца Лепельскага р-на Віцебскай вобл.), бел. вучоны ў галіне жывёлагадоўлі. Д-р с.-г. н. (1996), праф. (1997). Скончыў БСГА (1968), дзе і працуе (у 1993—2003 заг. кафедры, з 2003 прарэктар). Навук. працы па пытаннях павышэння малочнай і мясной прадукцыйнасці с.-г. жывёл, паляпшэння якасці прадукцыі пры ўвядзенні ў рацыён біял. дабавак расл. паходжання.

Тв.: Производство и использование премиксов. Л., 1980 (у сааўт.); Справочник по кормовым добавкам. 2 изд. Мн., 1990 (у сааўт.); Технология и стандартизация продуктов животноводства. Мн., 1993 (разам з М.С.Шашковым); Технология переработки рыбной продукции. 2 изд. Мн., 2001 (разам М.С.Шашковым, Р.П.Сідарэнка).

ШАЛА́МАЎ Варлам Ціханавіч (1.7.1907, г. Волагда, Расія — 17.1.1982), рускі пісьменнік. Вучыўся ў Маскоўскім ун-це (1926—29). Рэпрэсіраваны, у 1929—32, 1937—53 у лагерах і ссылках, у т.л. 5 гадоў на Калыме. Друкаваўся з 1932. У «Калымскіх апавяданнях» (нап. 1954—73, у СССР апубл. 1965, 1987), падкрэслена дакументальных і адначасова блізкіх да экзістэнцыяльнай прозы, лагерны вопыт прадстаўлены як гранічная сітуацыя, у якой выпрабоўваецца чалавек. У кн. вершаў «Крэсіва» (1961), «Дарога і лёс» (1967), «Маскоўскія аблокі» (1972), «Пункт кіпення» (1977) філас. ўспрыманне жыцця, пранікнёная любоў да прыроды. Аўтар літ.-крытычных артыкулаў, успамінаў і інш.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—4. М., 1998.

ШАЛАМЕ́НЦАВА (Шэламенцава) Людміла Сяргееўна (н. 28.5.1937, г. Растоў-на-Доне, Расія), бел. піяністка, педагог. Засл. дз. маст. Беларусі (1998). Праф. (1996). Скончыла Бел. кансерваторыю (1962; кл. М.Бергера). З 1962 выкладае ў Бел. акадэміі музыкі, адначасова з 1988 у муз. каледжы пры акадэміі (з 1995 заг. фартэпіяннага аддз.). Пра яе зняты тэлефільм «Людміла Шаламенцава» (1998) з серыі «Творцы».

Літ.: Капуста А. Людміла Шаламенцава: «Мэта педагога — узгадаваць асобу...» // Мастацтва. 1999. № 6; Латушка Н. Калі вучні «перамагаюць» Амерыку... // Там жа. 2002. № 3/4. *І.Л.Чэбан.*

ШАЛАМЫ́ (ад назвы в. Шаламы ў Слаўгарадскім р-не Магілёўскай вобл.), узгоркі і пакарочаныя грады, складзеныя з матэрыялу вял. ледавіковых адорвеняў, якія залягаюць блізка ад паверхні. Уваходзяць у комплекс краявых ледавіковых утварэнняў. Даўж. да некалькіх соцень метраў, адносныя выш. да 10—15 м. У ядры часцей залягаюць дэвонскія даламіты, вапнякі, мергелі, ра-

дзей гліны, пяскі і інш. Адарваныя пароды ў многіх выпадках не перакрыты марэнай і выходзяць на паверхню. Трапляюцца сярод адкладаў дняпроўскага і сожскага зледзянення на У Беларусі. З Ш. звязаны радовішчы далімітаў і вапнякоў. *Э.А.Ляўкоў.*

ШАЛА́ХАЎ Георгій Акімавіч (18.11.1899, в. Пушча Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл. — 22.5.1987), генерал-лейтэнант (1949). Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1932), Вышэйшыя курсы пры Акадэміі Генштаба (1950). З кастр. 1917 у Чырв. гвардыі, потым у Чырв. Арміі: камандзір узвода, роты, батальёна, нач. штаба корпуса, арміі. У Вял. Айч. вайну нач. штаба арміі і групы войск на Д.Усходзе, нам. нач. штаба 1-га Далёкаўсх. фронту, удзельнік вайны з Японіяй 1945. У 1945—69 на адказных пасадах у войсках, у цэнтр. апараце Мін-ва абароны СССР.

ШАЛЁМАВА Антаніна Алегаўна (н. 18.6.1953, г. Слонім Гродзенскай вобл.), бел. літаратуразнавец. Дачка А.*Лойкі*. Д-р філал. н. (2003). Скончыла БДУ (1975), з 1975 працавала ў ім. У 1996—98 у Іенскім ун-це (Германія), з 2000 у Ягелонскім ун-це (Польшча). Аўтар манаграфіі «Слова аб паходзе Ігаравым: паэтыка прасторы і часу» (2000), артыкулаў.

ШАЛЁНСТВА, вадабоязь, гідрафобія, вострая інфекцыйная хвароба чалавека і жывёл з групы *антрапазаанозаў*. Выклікаецца вірусамі сям. рабдавірусаў, характарызуецца пашкоджаннем цэнтр. нерв. сістэмы.

Вядома са стараж. часоў. Вірусную этыялогію Ш. даказаў Л.*Пастэр* (1881), ён жа распрацаваў вакцыну для прафілактыкі хваробы. У прыродзе хварэюць млекакормячыя, найб. прадстаўнікі драпежных, сярод свойскай жывёлы — буйн. раг. жывёла, сабакі, каты і інш. Заражэнне адбываецца праз сліну хворай жывёлы, найперш пры ўкусе. Магчыма таксама перадача інфекцыі праз інфіцыраваныя прадметы, мясныя і малочныя прадукты. Ад аднаго чалавека другому Ш. не перадаецца.

На Беларусі штогод ад Ш. памірае некалькі чалавек. Працягласць скрытага перыяду залежыць ад месца ўкусу, ад памеру і глыбіні пашкоджання тканак. Прыкметы ў чалавека: запаленне і прыпуханне на месцы ўкусу, праз 1—3 дні вадабоязь (хворы не можа піць ваду і ўжываць вадкую ежу ў выніку сутаргавага скарачэння мышцаў глоткі і гартані), аэрафобія (сутаргі выклікае подых паветра), фотафобія (узбуджальны ўплыў яркага святла) і інш. Смерць настае раптоўна ад паралічу сэрца або дыхання. Агульная працягласць хваробы 3—7 дзён. Спецыфічнага лячэння няма, прафілактыка ўключае выяўленне і знішчэнне хворых на Ш. жывёл і экстранныя антырабічныя прышчэпкі чалавеку пасля інфіцыравання.

А.А.Астапаў.

ШАЛЁНАЯ ЯГАДА, кветкавая расліна; гл. ў арт. *Красаўка*.

ШАЛЁНЫ АГУРО́К (Ecballium elaterium), кветкавая расліна сям. гарбузовых. Пашыраны ў Паўд. і Усх. Еўропе, у Цэнтр. і Зах. Азіі. Трапляецца на сухіх камяністых схілах, прыморскіх пясках, каля жылля.

Шматгадовая травяністая расліна. Сцёблы распасцёртыя або ўзыходныя, даўж. да 2 м, без вусікаў. Лісце лопасцевае, шурпатае, знізу шаравата-лямцавае. Кветкі жоўтыя, аднадомныя. Плады сакаўныя, эліптычныя, цвёрдашчаціністыя, даўж. 3—6 см, нагадваюць агурок, спелыя лёгка аддзяляюцца ад кветаножкі і выкідваюць праз адтуліну моцны струмень слізі з насеннем (адсюль назва). Вял. дозы соку пладоў выклікаюць атручэнне. Лек. расліна.

Дз.І.Траццякоў.

Шалёны агурок.



Віды шалёўкі: 1 — вертыкальная; 2 — гарызантальная з нашчыльнікамі; 3 — гарызантальная; 4 — ромбападобная; 5 — у елачку; 6 — камбінаваная.

«ШАЛЁНЫЯ» («Enragés»), назва прадстаўнікоў арганізацыйна не аформленай найб. радыкальнай левай плыні *Французскай рэвалюцыі 1789—99*, ідэолагаў гар. плебейства (Ж.Ру, Т.Леклерк, Ж.Ф.*Варле* і інш.). Іх ідэалогію найб. выразна адлюстравала выказванне Ру: «Свабода — пусты прывід, калі адзін клас людзей можа беспакарана прыгнятаць і марыць голадам іншы». Разам з *якабінцамі* падрыхтавалі паўстанне 31.5 — 2.6. 1793, якое скінула *жырандыстаў* і прывяло да ўлады якабінцаў. Рэзка крытыкавалі якабінскую Канстытуцыю 1793, патрабавалі ўвесці ў яе артыкулы аб абмежаванні прыватнай уласнасці і смяротным пакаранні для спекулянтаў. Падрыхтаванае пры ўдзеле «Ш.» выступленне парыжан 4—5.9.1793 прывяло да ўвядзення *Канвентам* цвёрдых цэн (максімумаў) на харч. і інш. тавары першай неабходнасці, абвяшчэння рэв. тэрору. Неўзабаве якабінцы, незадаволеныя радыкалізмам «Ш.», разгромілі іх.

Літ.: Манфред А.З. Великая французская революция. М., 1983.

ШАЛЁЎКА, знадворная абшыўка дошкамі ці дранкамі сцяны, франтона і інш. элементаў драўлянага будынка. Выконвае дэкар. і засцерагальную функцыі. З'явілася ў бел. манум. дойлідстве 17 ст. (пераважна ў сядзібна-палацавым і культавым) пад уплывам мураванай архітэктуры стылю рэнесансу. Пашырылася ў 2-й пал. 18 ст. ў архітэктуры стыляў класіцызму і ампіру. Стварала гарыз. (у сядзібным дойлідстве) ці верт. (у культавым дойлідстве) рытм. У нар. дойлідстве шырока выкарыстоўваецца з 1940—50-х г. Вядомы Ш. верт., верт. з нашчыльнікамі, гарыз., гарыз. з нашчыльнікамі, камбінаваная, у елачку, ромбападобная і інш. Найб. пашырана Ш. сцен з шэрагу гарыз. паясоў адметнага малюнка. Вуглы закрываюцца дошкамі, часта з накладнымі элементамі ці прапілоўкай. Дэкар. акцэнт узмацняюць фігурныя паяскі, ажурныя карнізы і інш. Арыгінальная Ш. франтонаў жылля цэнтр. Палесся з выкарыстаннем салярных матываў. Маст. выразнасць Ш. ўзмацняецца расфарбоўкай з выкарыстаннем кантрастных колераў ці розных адценняў аднаго колеру. Іл. гл. таксама да арт. *Народнае дойлідства*.

Я.М.Сахута.

ША́ЛІ (лац. Libra), адно з 12 сузор'яў *задыяка*. Знаходзіцца ў экватарыяльнай частцы *зорнага неба*. Найб. яркая зорка (α Ш.) 2,6 візуальнай *зорнай велічыні*; 50 зорак ярчэй 6-й зорнай велічыні. З тэр. Беларусі відаць вясной і ў пач. лета.

ША́ЛІ (Schally) Эндру Віктар (н. 30.11.1926, Вільня), амерыканскі вучоны ў галіне біяхіміі. Скончыў Лонданскі ун-т (1950) і ун-т Мак-Гіла (1955, Канада). З 1950 у Лонданскім Нац. ін-це мед. даследаванняў. З 1957 ва ун-це Бейлара (г. Х'юстан, ЗША). З 1962 у шпіталі Адміністрацыі ветэранаў (г. Но-

вы Арлеан, ЗША), з 1967 праф. Новаарлеанскага ун-та. Навук. працы па выяўленні і вывучэнні хім. будовы, біял. актыўнасці, сінтэзе і выкарыстанні ў клініцы гіпаталамічных рылізінг-гармонаў. Нобелеўская прэмія 1977 (з Р.Ш.Л.*Гійменам*.і Р.С.*Ялаў*). *В.Ф.Ермакоў.*

Э.В.**Шалі**.

Р.І.**Шалушкоў**.

ШАЛІГО́ЎСКІ (Szeligowski) Тадэвуш (15.9.1896, г. Львоў, Украіна — 10.1.1963), польскі кампазітар, педагог. Д-р юрыд. н. (1922). Скончыў Ягелонскі ун-т і кансерваторыю (1918) у Кракаве. У 1931—39 праф. кансерваторый у Познані і Вільні, з 1945 у Познані і Варшаве. Арганізатар і ўдзельнік экспедыцыі па зборы бел. фальклору на Гродзеншчыне. Сярод твораў: опера «Бунт жакаў» (паст. 1951), балеты «Паўлін і дзяўчына» (паст. 1949), «Мазепа» (паст. 1959), сімф. сюіта «Казюкі» (1927), пабудаваная на інтанацыях бел. і літ. фальклору, хар. апрацоўкі бел. нар. песень «Перапёлка», «Дробны дожджык», «Ой, заржы, заржы» і інш. Сярод вучняў В.*Рудзінскі*, Г.*Цітовіч*. Дзярж. прэміі Польшчы 1950, 1951. *Г.І.Цітовіч.*



Сузор'е **Шалі**.

ШАЛКАРТЭНІ́З, Чэлкартэнгіз, саланчак у Казахстане, на ПнУ ад Аральскага м. Пл. каля 1,8 тыс. км². Вясной напаўняецца вадой рэк Ігліз і Тургай, ператвараючыся ў горка-салёнае возера глыб. 2—3 м.

ШАЛКО́ВА-ШЭ́ЛЕГАЎСКІ БОЙ 1943, бой партыз. брыгады «Смерць фашызму» з ням. фашыстамі ў вёсках Шалкова і Шэлегаўка Полацкага р-на Віцебскай вобл. 10.5.1943 у Вял. Айч. вайну. У час падрыхтоўкі да карнай аперацыі супраць партызан 624-ы ахоўны батальён гітлераўцаў выселіў з названых вёсак усіх жыхароў і размясціўся ў іх. Кіраўніцтва партыз. брыгады (камандзір У.В.Мельнікаў) распрацавала план знішчэння карнікаў. У ноч на 10 мая штурмавыя групы партызан атакавалі фаш. гарнізоны ў гэтых вёсках. У выніку баёў партызаны знішчылі больш за 100 гітлераўцаў, іх склады з боепрыпасамі і харчаваннем, захапілі штабныя дакументы, кулямёты, аўтаматы, вінтоўкі, амуніцыю, коней і інш. *У.С.Пасэ.*

ШАЛКО́ВІЧ (Шолкавіч, Шаўковіч) Сямён Вуколавіч (15.5.1840, в. Тонеж Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл. — 20.10.1886), бел. гісторык, археограф. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю, Кіеўскі ун-т (1863). З 1864 настаўнік Віленскага мужчынскага дваранскага ін-та (пасля рэарганізацыі — рэальная прагімназія, з 1868 рэальнае вучылішча). З 1870 чл. *Віленскай археаграфічнай камісіі*. Удзельнічаў у падрыхтоўцы 14 тамоў прац камісіі. Аўтар прадмоў да 4, 5, 9 і 13-га тамоў *Актаў Віленскай камісіі*, «*Пісцовай кнігі былога Пінскага староства*» (1874), «Рэвізіі Кобрынскай эканоміі» (1876), «*Пісцовай кнігі Гродзенскай эканоміі*» (1881—82) і інш. Падрыхтаваў «Зборнік палеаграфічных здымкаў са старажытных грамат і актаў, якія захоўваюцца ў Віленскім цэнтральным архіве і Віленскай публічнай бібліятэцы» (1884), у якім змешчаны ўзоры дзелавой пісьменнасці ВКЛ 15—16 ст. Навук. погляды Ш. вызначаліся крайнім манархізмам і паланафобіяй, што асабліва характэрна для падрыхтаваных ім прац «Зборнік артыкулаў, якія тлумачаць польскую справу адносна Заходняй Расіі» (вып. 1—2, 1885—87), «Аб межах Польскай кароны і Вялікага княства Літоўскага» (1885). *М.Ф.Шумейка.*

ШАЛМЕ́Й, шаламай (ням. Schalmei), 1) старадаўні драўляны духавы язычковы муз. інструмент з падвойным пішчыкам.

Меў 6—8 пальцавых і клапанныя адтуліны. Гукарад пераважна дыятанічны. Сярод разнавіднасцей Ш.: дыскантавыя, сапранавыя; яны разам з померамі (сярэдняга дыяпазону) і бамбардамі (бамгартамі; нізкага дыяпазону) складалі групу інструментаў, пашыраную ў Зах. і Цэнтр. Еўропе ў 13—17 ст. Ш. — папярэднік габоя ў складзе разнастайных ансамбляў. У бел. крыніцах Ш. зафіксаваны ў 16—17 ст. (у Гродзенскай капэле Стафана Баторыя і інш.).

2) Паводле некат. крыніц, назва ўсіх сярэдневяковых прамых язычковых інструментаў. 3) Рэгістр аргана.

Літ.: Левин С. Духовые инструменты в истории музыкальной культуры. Ч.2. Л., 1983. *А.В.Фралоў.*

ШАЛУШКО́Ў Рыгор Іванавіч (19.5.1899, в. Бронская Рудня Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. — 1943), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыят. падполля і партыз. руху на Жытоміршчыне (Украіна) у Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1965). З 1918 у Чырв. Арміі на Усх. і Паўд. франтах. З 1926 на гасп. і парт. рабоце ў Жытомірскай вобл. У пач. Вял. Айч. вайны пакінуты ў тыле ворага для арганізацыі падп. барацьбы, сакратар Жытомірскага падп. абкома ВКП(б), які каардынаваў і накіроўваў дзейнасць 12 райкомаў партыі, 75 падп. арг-цый і груп (больш за 25 тыс. чал.), 10 партыз. атрадаў. Сіламі падполля пушчана пад адхон 34 эшалоны, узарвана 18 мастоў ворага, створана 5 друкарняў і інш. 23.5.1943 арыштаваны, расстраляны гітлераўцамі. У г. Жытомір яму пастаўлены помнік.

ШАЛФЕ́Й, сальвія (Salvia), род кветкавых раслін сям. губакветных (ясноткавых). Каля 700 відаў. Пашыраны ўсюды. Шэраг відаў вырошчваецца як лек. (напр., Ш. лекавы — S. officinalis), эфіраалейныя (напр., Ш. мускатны — S. sclarea) або дэкар. (напр., Ш. цудоўны — S. splendens) культуры. На Беларусі 4 віды Ш.: адагнуты (S. reflexa); дубровуны (S. nemorosa); кальчаковы

Шалфей лекавы.

(S. verticillata); лугавы (S. pratensis), нар. назва жаўрэц, занесены ў Чырв. кнігу. Трапляюцца ў хваёвых лясах, па сухіх схілах, уздоўж дарог. Культывуецца 15 відаў.

Адна- і шматгадовыя травы, кусты і паўкусты выш. 20—130 см. Лісце простае або перыстае. Кветкі жоўтыя, фіялетавыя, бэзавыя, белыя, чырв. ў коласападобных суквецціях. Плод — арэшак. Лек., эфіраалейныя, меданосныя і дэкар. расліны. *Дз.І.Трацяк.*

ШАЛЫ́ГА Мікалай Уладзіміравіч (н. 14.11.1950, в. Краснае Ушацкага р-на Віцебскай вобл.), бел. вучоны ў галіне малекулярнай біяфізікі і біяхіміі. Д-р біял. н. (2001). Скончыў Віцебскі пед. ін-т (1973). З 1976 у Ін-це фотабіялогіі Нац. АН Беларусі (з 2002 заг. лабараторыі). Навук. працы па рэгуляцыі біясінтэзу тэтрапіролаў, фотадынамічных працэсах, акісляльным стрэсе і антыаксідантных сістэмах.

Тв.: Фотобиология и мембранная биофизика. Мн., 1999 (у сааўт.); Идентификация форм порфириновых предшественников хлорофилла и их физиологического действия в зеленых проростках ячменя // Физиология растений. 1999. Т. 46, № 5. *С.С.Мельнікаў.*

ШАЛЬГРЭ́Н (Chalgrin) Жан Франсуа (1739, Парыж — 21.1.1811), французскі архітэктар. Вучыўся ў Дж.Н.Сервандоні і Л.П.Маро-Дэпру; наведаў Рым (1758). Пабудаваў у Парыжы ў стылі класіцызму шэраг асабнякоў (1760-я г.), царкву Сен-Філіп-дзю-Руль (1769—84). Асн. яго работа — трыумфальная арка на пл. Зоркі (цяпер пл. дэ Голя; 1806—37; іл. гл. да арт. *Парыж*).

ШАЛЬКЕ́ВІЧ Валянцін Браніслававіч (10.12.1945, Мінск — 31.1.2001), бел. вучоны ў галіне неўралогіі і нейрахірургіі. Д-р мед. н. (1989), праф. (1990). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1969). З 1969 у НДІ неўралогіі, нейрахірургіі і фізіятэрапіі (з 1980 нам. дырэктара). Навук. працы па сасудзістай паталогіі галаўнога мозга. Заснаваў на Беларусі кірунак па вывучэнні і распрацоўцы найб. эфектыўных метадаў лячэння і дыягностыкі захворванняў нерв. сістэмы з дапамогай гіпер- і гіпабаратэрапіі.

Тв.: Биоэлектрическая активность головного мозга под влиянием гипобаротерапии у больных мигренью (разам з Г.І.Аўсянкінай, К.А.Садоха) // Периферическая нервная система: Сб. науч. тр. Мн., 1997. Вып. 20; Повторные ишемические инсульты (разам з С.Р.Котавай) // Мед. новости. 1999. № 4.

ШАЛЬКЕ́ВІЧ Вячаслаў Феліксавіч (н. 18.9.1941, ст. Ганзурына, Бурацыя, Расія), бел. філосаф і гісторык. Д-р філас. н. (1994), праф. (1997). Скончыў БДУ (1967), дзе і працаваў да 2000. У 1986—89 у Вроцлаўскай с.-г. акадэміі (Польшча). З 2002 у Мінскім ін-це кіравання. Навук. працы па гісторыі грамадска-паліт. і філас. думкі Беларусі, Расіі і Польшчы 16—20 ст., аб жыцці і дзейнасці К.Каліноўскага, Ф.Скарыны; пра светапогляд Вальтэра, Э.Канта, Сен-Сімона, Л.Феербаха, К.Маркса і інш.

Тв.: Філасофская думка ў Беларусі. Мн., 1976; Скарына і наш час. Мн., 1979; Казимир Лышчинский. Мн., 1986 (разам з К.С.Пракошынай); К.Калиновский: Страницы биогр. Мн., 1988; Сыны і пасынкі Беларусі. Мн., 1996 (у сааўт.); Скорина и Скориниана. Мн., 2001; Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі. 3 выд. Мн., 2002. *М.П.Савік.*

ШАЛЬМА́НАЎ Іван Ігнатавіч (5.9.1936, в. Каромка Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл. — 10.7.1993), бел. пісьменнік. Скончыў Вышэйшыя літ. курсы ў Маскве (1983). Працаваў на прадпрыемствах Мінска, у газ. «Связист Белоруссии», у Мінскім абл. Доме нар. творчасці; у 1968—75 і з 1981 на Бел. радыё. Друкаваўся з 1960. У зб-ках апавяданняў «Дзень пачаўся» (1969) складаныя вытв. і асабістыя адносіны людзей. Аповесці «Зарыва ўначы» (1968), «Цагельня» (1976) пра маладых рабочых. Пісаў нарысы.

ША́ЛЬНІК (Alisma), род кветкавых раслін сям. шальнікавых. 10—11 відаў. Пашыраны пераважна ва ўмеранай зоне Паўн. паўшар'я і ў Аўстраліі. На Беларусі 3 віды Ш.: злакападобны (A. gramineum); ланцэтападобны (A. lanceolatum); трыпутнікавы (A. plantago-aquatica), нар. назва шалянец. Трапляюцца па нізінных балотах, вільготных лугах, у прыбярэжнай зоне вадаёмаў.

Шальнік трыпутнікавы.

Шматгадовыя водныя травяністыя расліны. Лісце суцэльнае, чаранковае, у прыкараневай разетцы. Кветкі двухполыя, белыя, у мяцёлчатым суквецці. Плод — шматарэшак. Корм для андатры і качак. Трава ў свежым выглядзе ядавітая для жывёлы.

ШАЛЮ́ТА Уладзімір Лук'янавіч (н. 2.12.1938, с. Свяцілавічы Веткаўскага р-на Гомельскай вобл.), бел. вучоны ў галіне фармацэўтычных навук. Д-р фармацэўтычных н., праф. (1989). Скончыў Віцебскі мед. ін-т (1966), дзе і працуе (у 1979—81 нам. дэкана, у 1981—96 і ў 1997—2001 заг. кафедры, у 1996—97 дэкан). Навук. працы па пошуку і вывучэнні біялагічна актыўных рэчываў у раслінах, распрацоўцы нарматыўнай дакументацыі на лек. расл. сыравіну.

Тв.: Фармакогнозия. Витебск, 2003 (у сааўт.); Лекарственные растения Беларуси: Справ. Витебск, 2003.

ШАЛЯ́ПІН Фёдар Іванавіч (13.2.1873, Казань, Татарстан — 12.4.1938), расійскі спявак (бас); найбуйнейшы прадстаўнік рас. вакальнай школы. Нар. арт.

Ф.І.Шаляпін.

Рэспублікі (1918). У 1893 дэбютаваў як оперны спявак у Тыфлісе, у 1895 саліст Марыінскага т-ра ў Пецярбургу, з 1896 маскоўскай прыватнай рус. оперы С.Мамантава, з 1899 (з перапынкам) спяваў у т-рах Вял. ў Маскве, Марыінскім (у 1918 маст. кіраўнік), удзельнічаў у «Рускіх сезонах» С.Дзягілева. Вёў гастрольную дзейнасць, у т.л. ў 1896 у Мінску. З 1922 за мяжой. Ідэйна і эстэтычна фарміраваўся ў цесным кантакце з М.Горкім, К.Каровіным, С.Рахманінавым, У.Стасавым, В.Сяровым, М.Урубелем і інш. Стварыў галерэю рознахарактарных вобразаў, раскрываючы складаны ўнутраны свет героя. Сярод творчых дасягненняў партыі: трагедыйныя — Барыс Гадуноў («Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага), Іван Грозны («Пскавіцянка» М.Рымскага-Корсакава); гераіка-эпічная — Іван Сусанін («Іван Сусанін» М.Глінкі); эпічная — Дасіфей («Хаваншчына» Мусаргскага); быт. — Яромка («Варожая сіла» А.Сярова), Варлаам («Барыс Гадуноў»); рамант. — Мефістофель («Фауст» Ш.Гуно і «Мефістофель» А.Бойта), Дэман («Дэман» А.Рубінштэйна), Дон Кіхот («Дон Кіхот» Ж.Маснэ); камед. — Фарлаф («Руслан і Людміла» Глінкі), Лепарэла («Дон Жуан» В.А.Моцарта); сатыр. — Дон Базіліо («Севільскі цырульнік» Дж.Расіні) і інш. Майстар выканання рус. нар. песень, рус. і зах.-еўрап. камерна-вак. лірыкі. Паставіў оперы «Хаваншчына», «Дон Кіхот». Здымаўся ў кіно («Іван Грозны», «Дон Кіхот»). Аўтар літ., графічных, жывапісных, скульпт. работ. Напісаў кн. «Маска і душа» (1932), аўтабіяграфію «Старонкі з майго жыцця» (апубл. 1957). У 1984 прах Ш. перанесены з Парыжа ў

Маскву. У Казані праводзяцца Оперны фестываль (з 1982, з 1991 міжнар.), конкурс оперных спевакоў (з 1989, з 1993 міжнар.) імя Ш.

Тв.: Страницы из моей жизни. Маска и душа. М., 1990.

Літ.: Янковский М.О. Шаляпин. Л., 1972; Ф.И.Шаляпин. Т. 1—3. 3 изд. М., 1976—79; Ф.И.Шаляпин: Летопись жизни и творчества. Кн. 1—2. 2 изд. Л., 1988—89.

А.А.Саламаха.

ША́МАВА, вёска ў Раздзельскім с/с Мсціслаўскага р-на Магілёўскай вобл., каля аўтадарогі Мсціслаў—Горкі. За 34 км на ПнЗ ад г. Мсціслаў, 100 км ад Магілёва, 18 км ад чыг. ст. Цёмны Лес. 125 ж., 56 двароў (2003). Дом культуры, б-ка. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнікі ахвярам фашызму і землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

Вядома з пач. 18 ст. У 1737 вёска ў Мсціслаўскай правінцыі, мела драўляную царкву. З 1777 мястэчка, 2 разы на год адбываліся кірмашы. З 1784 цэнтр воласці Мсціслаўскага пав. У 1846 у Магілёўскім пав., 314 ж. У 1861 мястэчка ў Мсціслаўскім пав., 489 ж., 105 двароў, школа, царква. У 1879 засн. ваўначоска і крупадзёрка. У 1880 — 741 ж., 91 двор, школа, лячэбніца, аптэка, царква, 30 крам. У 1897 — 917 ж., 107 двароў, 2 крупадзёркі, вадзяны млын, паштовае аддз., хлебазапасны магазін, 32 крамы, 4 карчмы; праводзіліся 7-дзённы кірмаш і 2-дзённы таржок. З 20.8.1924 да 29.8.1959 цэнтр сельсавета Мсціслаўскага р-на. У 1929 пабудаваны торфазавод, дзейнічалі сукнавальня, шавецкая майстэрня, мех. млын. У 1940 — 920 ж., 228 двароў. У Вял. Айч. вайну ням. фашысты ў ліст. 1941, ліп. 1942 і вер. 1943 палілі вёску, загубілі 500 жыхароў. *М.Б.Батвіннік.*

ШАМАЙЛ (араб. — абярэг), тое, што *мугір*. Тэрмін Ш. звычайна ўжываецца ў казанскіх татараў.

ШАМА́НСТВА, шаманізм, ранняя форма рэлігіі, заснаваная на веры ў зносіны шамана, які знаходзіцца ў стане рытуальнага экстазу (камлання), з духамі. Шаманам прыпісвалася таксама здольнасць прадказваць будучыню, лячыць ад хвароб, выклікаць змены ў прыродзе, праводзіць памерлых у падземны свет і да т.п. Вядома многім народам Афрыкі, Паўн. Еўразіі, Усх. Азіі, індзейцам Амерыкі і інш. Рысы Ш. былі ўласцівы і стараж.-рус. жрацам (валхвам).

ША́МАШ, у акадскай (асіра-вавілонскай) рэлігіі і міфалогіі бог сонца, правасуддзя і прадказанняў. Паводле міфаў, Ш.-сонца раніцай падымаўся з-за гор, рабіў дзённы шлях па небе і вечарам зноў заходзіў за горы; ноччу ён падарожнічаў па падземным свеце, дзе даваў нябожчыкам святло, пітво і ежу. У шумерскай міфалогіі Ш. адпавядаў бог Уту.

ШАМБО́РСКІ Фама (Цімафей), бел. танцоўшчык канца 18 — пач. 19 ст. Прыгонны графа С.Г.Зорыча. Выконваў партыі адмоўных персанажаў у балетах *Шклоўскага тэатра Зорыча*. У 1800 у ліку 14 лепшых артыстаў, адабраных для сталічнай сцэны балетмайстрам І.*Вальберхам*, перададзены ў балетную трупу Пецярб. імператарскіх т-раў, дзе выступаў у тым жа амплуа.

ШАМБЯЛЯ́Н (ад франц. chambellan), прыдворны тытул у Рэчы Паспалітай у 18 ст. Замяніў тытул дворнага падкаморыя. Кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі для забеспячэння падтрымкі ў розных колах шляхты прызначаў мноства Ш. Іх абавязкам быў удзел у святочных цырымоніях пры двары. Насілі шыты мундзір, стужку з пазалочаным ключом на левым бядры. У Рас. імперыі яму адпавядаў прыдворны чын камергер.

ШАМЕ́Т (Chaumette) П'ер Гаспар (у час рэвалюцыі прыняў імя Анаксагор; 24.5.1763, г. Невер, Францыя — 13.4.1794), дзеяч *Французскай рэвалюцыі 1789—99*, левы якабінец. Са снеж. 1792 пракурор *Парыжскай камуны 1789—94*. Дамагаўся ўвядзення ўзмоцненага падаткаабкладання багацеяў, ліквідацыі беспрацоўя, павышэння зарплаты рабочым. Узначаліў выступленне парыжскай беднаты 4—5.9.1793, якое падштурхнула *Канвент* увесці цвёрдыя цэны (максімумы) на прадукты першай неабходнасці. Абвінавачаны М.*Рабесп'ерам* у імкненні супрацьпаставіць Камуну Канвенту і пакараны смерцю (гільяцінаваны).

ШАМЕТАВЕ́Ц Таццяна Рамуальдаўна (н. 1.1.1960, Мінск), бел. артыстка балета. Засл. арт. Беларусі (1990). Скончыла Бел. харэаграфічнае вучылішча (1979, клас І.*Савельевай*). З 1979 салістка Нац. акад. т-ра балета Беларусі. Танцоўшчыца шматграннай адоранасці, аднолькава свабодна валодае тэхнікай класічнага і сучаснага танца, выконвае партыі характарнага плана. Сярод партый у нац. рэпертуары: Нявеста («Крылы памяці» У.Кандрусевіча), Ганна Багранародная («Страсці» А.Мдывані), Дзяўчына («Кругаверць» А.Залётнева). З інш. рэпертуару: Зарэма («Бахчысарайскі фантан» Б.Асаф'ева), Блудніца («Карміна Бурана» на муз. К.Орфа), Дзяўчына («Балеро» на муз. М.Равеля), Мерседэс і сола («Дон Кіхот» і «Пахіта» Л.Мінкуса), Дзева-выбранніца («Вясна свяшчэнная» І.Стравінскага), Мірта («Жызэль» А.Адана), Кармэн («Кармэн-сюіта» Ж.Бізэ — Р.Шчадрына), сеньёра Капулеці («Рамэо і Джульета» С.Пракоф'ева), танцы ў операх.

Літ.: Чурко Ю.М. Белорусский балет в лицах. Мн., 1988; Мушынская Т. Гаркавы смак ісціны: Партрэты. Мн., 1993.

ШАМІ́ЛЬ (каля 1799, аул Гімры, Дагестан — сак. 1871), трэці *імам* Дагестана і Чэчні (1834—59), кіраўнік вызв. барацьбы каўказскіх горцаў супраць войск Рас. імперыі і мясц. феадалаў (гл. *Каўказская вайна 1817—64*), заснавальнік *імамата*. З сям'і аварскага селяніна. Выхоўваўся ў асяроддзі мусульм. духавенства. Умелы прамоўца, здольны арганізатар Ш. набыў папулярнасць у народзе, аб'яднаў горцаў, падпарадкаваў сабе дагестанскіх феадалаў. Як рэліг. правадыр быў падтрыманы знаццю і мусульм. духавенствам, абвясціў «газават» — свяшчэнную вайну супраць гяураў («няправільных»), г. зн. супраць расіян. Як таленавіты палкаводзец у 1840-я г. атрымаў шэраг перамог над рас. войскамі. У сваёй ваен.-тэакратычнай дзяржаве ўстанавіў дыктатарскі рэжым, захаваў панаванне мясц. феадалаў, што аслабіла супраціўленне горцаў. У 1859 Ш. з невял. атрадам асаджаны рас. войскамі ў ауле Гуніб і здаўся ў палон на пачэсных умовах. Паселены з сям'ёй у г. Калуга (у 1860-я г. некат. час жыў у Кіеве). У 1870 з дазволу рас. улад выехаў у Мекку, па дарозе памёр у г. Медына.

Шаміль.

ШАМІ́Р (сапр. Язерніцкі) Іцхак (н. 15.10.1915, г.п. Ружаны Брэсцкай вобл.), дзяржаўны і паліт. дзеяч Ізраіля. Вучыўся ў Варшаўскім ун-це і Яўрэйскім ун-це Іерусаліма. З пач. 1930-х г. у сіянісцкім руху. З 1935 у Палесціне, дзе ўдзельнічаў у дзейнасці сіянісцкіх арг-цый, у т.л. тэрарыст. «групы Штэрна». У 1941 і 1946 быў арыштаваны брыт. ўладамі, у 1946—48 у эміграцыі. Пасля стварэння Ізраіля да 1965 у разведцы «Масад». З 1970 член, з 1975 старшыня Выканкома партыі «Херут», якая з 1973 дзейнічае ў складзе блока «Лікуд». З 1973 дэп., у 1977—80 спікер кнесета (парламента). У 1980—83 міністр замежных спраў. У 1983—84 і 1986—92 прэм'ер-міністр Ізраіля. *В.У.Адзярыха.*

ШАМІ́СА (Chamisso) Адэльберт фон (30.1.1781, Шампань, Францыя — 21.8.1838), нямецкі пісьменнік, вучоны-прыродазнавец. У 1812—15 вывучаў медыцыну, батаніку, заалогію ў Берлінскім ун-це. У 1815—18 як натураліст прыняў удзел у рас. кругасветнай экспедыцыі (кн. «Падарожжа вакол свету на караблі «Рурык», 1834—36). У фантаст. аповесці «Незвычайная гісторыя Петэра Шлеміля» (1814) рамант. пратэст супраць адчужанасці асобы ў несправядлівым грамадстве і згубнага ўплыву золата на чалавечы лёс. Паэзія Ш. вызначаецца дэмакр. накіраванасцю (вершы «Замак Банкур», «Інвалід у вар'яцкім доме»), простай і эмацыянальна выразнай формай, блізкай да традыцыі ням.

нар. песні (лірычны цыкл «Песні і абразкі жыцця», 1830; цыкл балад «Нямецкія народныя паданні», 1838). Тэма вызв. барацьбы, вобразы грэч., ісп., рус., польскіх патрыётаў у цыклах «Вандраванні» (1830), «Выгнаннікі» (1831). Перакладаў з франц., ісп., дацкай, рус. моў. Яго лірычны цыкл «Каханне і жыццё жанчыны» (1830) паклаў на музыку Р.Шуман. На бел. мову асобныя творы Ш. пераклалі А.Зарыцкі, У.Папковіч.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Закаханы вандроўнік: Паэзія ням. рамантызму. Мн., 1989; Рус. пер. — Избранное. М., 1974. *С.Дз.Малюковіч.*

ШАМО́Т (франц. chamotte), вогнетрывалая гліна або каалін, абпаленыя да страты пластычнасці. Дробнамолаты Ш. дабаўляюць у вогнетрывалую гліну для рэгулявання пластычнасці ўсадкі пры сушцы і абпале. З 1920-х г. Ш. выкарыстоўваюць у маст. кераміцы, садова-паркавай пластыцы, манум.-дэкар. мастацтве, у аздабленні фасадаў будынкаў, пры стварэнні скульптуры. Вырабы з шамотнай масы дэкарыруюць солямі металаў, палівай. *В.І.Жук.*

ШАМПАЛЬЁН (Champollion) Жан Франсуа (24.12.1790, г. Фіжак, Францыя — 4.3.1832), французскі егіптолаг, заснавальнік *егіпталогіі*. Ганаровы чл. Пецярбургскай АН (1826), чл. франц. Акадэміі подпісаў (1831). Вучыўся ў Школе ўсх. моў у Калеж дэ Франс (1807—09). З 1809 выкладаў ва ун-це Грэнобля (з 1818 праф.). Пасля шматгадовай працы над дэшыфроўкай егіп. *іерогліфаў* у 1822 прачытаў надпіс на *Разецкім камені*; распрацаваў прынцыпы дэшыфроўкі і вызначыў паслядоўнасць развіцця егіп. іерагліфічнага пісьма (іерагліфічнае, іератычнае, дэматычнае). У 1824—26 вывучаў егіп. помнікі ў музеях Італіі, потым працаваў хавальнікам Егіп. музея ў Луўры. У 1828—30 кіраваў экспедыцыяй у Егіпет, сабраў і скапіраваў шмат егіп. тэкстаў, помнікаў і выяў. У 1831 узначаліў першую ў свеце кафедру егіпталогіі ў Калеж дэ Франс. Склаў першыя граматыку і слоўнік стараж.-егіп. мовы.

Тв.: Рус. пер. — О египетском иероглифическом алфавите. М., 1950.

ШАМПА́НСКАЕ, пеністае вінаграднае віно, насычанае вуглякіслым газам эндагеннага паходжання. Атрымліваюць другасным браджэннем шампанскіх вінаматэрыялаў са спец. сартоў вінаграду ў герметычна закаркаваных бутэльках ці рэзервуарах, што стварае залішні ціск не менш за 350 кПа. Паводле колькасці цукру адрозніваюць маркі Ш.: брут (да 1,5 г/100 см^3), сухое (2—2,5 г/см^3), паўсухое (4—4,5 г/100 см^3), паўсалодкае (6—6,5 г/100 см^3), салодкае (8—8,5 г/100 см^3). Назва ад правінцыі Шампань (Францыя), дзе яно ўпершыню было прыгатавана ў 17 ст. *К.А.Алексанян.*

ШАМПА́НЬ (Champagne), гістарычная вобласць і сучасны эканам. раён (Шампань—Ардэны) на ПнУ Францыі. Уключае дэпартаменты Марна, Верх. Марна, Об, Ардэны. Пл. 25,7 тыс. км^2. Нас. 1,3 млн. чал. (1996). Гал. горад — *Рэймс*. Большая ч. тэр. — хвалістая раўніна. На ПнУ — адгор'і *Ардэнаў*, на З — куэста Іль-дэ-Франс. Гал. р. Сена з прытокам Марна злучаны каналамі з рэкамі бас. Рэйна і Соны. Гаспадарка індустр.-агр. тыпу. Прам-сць: машынабудаванне і металаапрацоўка, у т.л. вытв-сць абсталявання для тэкст. прам-сці, лёгкая (тэкст., трыкат., вытв-сць дываноў і галантарэйных вырабаў), харч. (у т.л. вытв-сць шампанскіх він), дрэваапр. і папяровая. Вырошчваюць пераважна збожжавыя (пшаніца, ячмень, кукуруза) культуры. Вінаградарства (на схілах куэсты Іль-дэ-Франс). Развіта жывёлагадоўля.

У пісьмовых крыніцах тэрмін «Шампань» упершыню сустракаецца як назва графства, створанага ў 2-й пал. 9—10 ст. пасля аб'яднання графстваў Труа і Мо. Буйн. гарадамі Ш. былі Труа (адм. ц.) і Рэймс (месца каранацыі франц. каралёў). У правінцыі развіваліся авечкагадоўля, з 14 ст. — вінаробства (у канцы 17 ст. тут упершыню арганізавана вытв-сць пеністых він). Вял. ролю ў зах.-еўрап. гандлі 12—13 ст. адыгрывалі кірмашы, якія перамяшчаліся з аднаго горада ў другі (Ланьі, Бар-сюр-Об, Правен, Труа) і дзейнічалі ў Ш. амаль круглы год. У 1284 (канчаткова ў 1361) Ш. далучана да каралеўскага дамена. У час *Стогадовай вайны 1337—1453* Ш. — месца гал. ваен. дзеянняў, што падарвала эканам. значэнне яе кірмашоў. У 1358 на частку тэр. Ш. пашырылася сял. паўстанне *Жакерыя*. Пасля падзелу ў 1790 тэр. Францыі на дэпартаменты прав. Ш. скасавана.

ШАМПЕ́НЬ (Champaigne) Філіп дэ (хрышчаны 26.5.1602, г. Брусель — 12.8.1674), французскі жывапісец; прадстаўнік класіцызму. З 1621 працаваў у Парыжы, з 1625 прыдворны жывапісец. Адзін з заснавальнікаў Каралеўскай акадэміі жывапісу і скульптуры (1648). Выконваў дэкар. работы ў парыжскіх палацах (Люксембургскім, з Н.*Пусэнам*) і цэрквах. Пад уплывам *янсенізму* пісаў аскетычна-стрыманыя рэліг. карціны («Тайная вячэра», 1648). У псіхалагічна завостраных, строгіх паводле стылю парадных партрэтах спалучаў рысы фламандскага рэалізму і ранняга франц. класіцызму: «А.Ж.Рышэльё» (1636), «Дж.Мазарыні». Пісаў таксама групавыя партрэты: «Партрэт дачкі ў адзенні манахіні з абатысай Агнесай», «Пасвячэнне герцага Анжуйскага ў рыцары ордэна Святога Духа» (абодва 1662).

ШАМПІНЬЁН, пячурыца (Agaricus), род шапкавых базідыяльных грыбоў сям. агарыкавых. Каля 60 відаў. Пашыраны ўсюды. У прамысл. маштабах вырошчваюць Ш. двухспоравы (A.bisporus), у культуры каля 300 гадоў. На Беларусі 8 відаў, усе ядомыя. Найб. вядомыя Ш.: двухспоравы, звычайны (A.campester), лясны (A.silvaticus), палявы, або пячарка (A.arvensis), ядомы (A.bitorquis). Трапляюцца пераважна групамі з мая па вер. на ўрадлівай глебе ў лясах, садах, на лугах, палях, агародах.

Шапка пукатая, потым распасцёртая, шаўкавістая, гладкая або лускаватая, мясістая, дыям. ад 3 да 25 см. Пласцінкі свабодныя, напачатку белыя, потым цямнеюць. Паводле гэтай прыкметы Ш. адрозніваюць ад смяротна ядавітай *бледнай паганкі*, у якой споры, а таму і пласцінкі, застаюцца белымі. Мякаць белая, шчыльная, на зломе мяняе колер. Ножка цыліндрычная або булавападобная, шчыльная, рэдка рыхлая або полая, заўжды з кольцам ад пакрывала. Споры акруглыя, гладкія, светла-карычневыя, карычневыя. 2 віды (A.meleagris і A.xanthoderma) ядавітыя.

ШАМПЛЕ́ЙН, Шамплен (Champlain) Самюэль (1567, Бруаж каля г. Рашфор, Францыя — 25.12.1635), французскі гідрограф, даследчык Канады і ПнУ ЗША. У 1603 здзейсніў падарожжа па рэках Св. Лаўрэнція і Сагеней. У 1604—06 правёў даследаванні ўздоўж Атлантычнага ўзбярэжжа Паўн. Амерыкі (п-авы Новая Шатландыя і Кейп-Код, зал. Фанды, Масачусетс), адкрыў в-аў Нантакет. У 1608 у вусці р. Св. Лаўрэнція заснаваў г. Квебек, у 1609 даследаваў р. Рышэльё — правы прыток р. Св. Лаўрэнція, адкрыў возера, пазней названае яго імем, горы Адырондак і Зялёныя горы (Грын-Маўн-

Ф. дэ **Шампень**. Партрэт дачкі ў адзенні манахіні з абатысай Агнесай. 1662.

тынс). У 1609—15 займаўся пошукам водных шляхоў да Ціхага ак., у 1615—16 па рэках Св. Лаўрэнція, Атава, воз. Ніпісінг і інш. дасягнуў воз. Гурон.

Літ.: Магидович И.П. История открытия и исследования Северной Америки. М., 1962.

ШАМПУ́НЬ (ад англ. champooing мыццё галавы), хімічны прэпарат, прызначаны для выдалення забруджванняў з паверхні скуры галавы і валасоў чалавека; разнавіднасць *мыйных сродкаў*. У аснове Ш. — аніённыя, неіёнагенныя і амфатэрныя *паверхнева-актыўныя рэчывы*, таксама латалін, біялагічна актыўныя рэчывы (вітаміны, эфірныя алеі, расл. экстракты і настоі), духмяныя рэчывы і інш.

ШАМУ́КАЎ Габдула Рухулавіч (24.12.1909, Уфа, Башкортастан — 1981), татарскі акцёр. Нар. арт. Татарстана (1950). Нар. арт. Расіі (1957). Нар. арт. СССР (1980). Скончыў Казанскі пед. ін-т. З 1930 у Башк. т-ры імя М.Гафуры ва Уфе, з 1946 у Тат. т-ры імя Г.Камала ў Казані. Сярод роляў: Тукай («Тукай» А.Файзі), Галімулін, Ахун, Балтаеў («Муланур Вахітаў», «Хаджа Насрэтдзін», «Зіфа» Н.Ісанбета), Дармідонт, Цяляцеў («Позняе каханне», «Шалёныя грошы» А.Астроўскага), Труфальдзіна («Слуга двух гаспадароў» К.Гальдоні). Пераклаў на тат. мову «Гора ад розуму» А.Грыбаедава, трагедыі У.Шэкспіра, Ф.Шылера, Эсхіла, А.Пушкіна.

ШАМУРА́МАТ, Самурамат, асірыйская царыца, жонка цара Шамшыядада V, маці Ададнірары III і рэгентша ў гады яго маленства [810—806 да н.э.]. Вяла войны ў Мідыі. У ант. л-ры вядома пад імем Семіраміды (упершыню ў грэч. пісьменніка Ктэсія, канец 5 — пач. 4 ст. да н.э.). Ёй прыпісваюцца цудоўныя прыгоды і з яе імем звязаны «вісячыя сады» («сады Семіраміды») — адно з «сямі цудаў свету». У арм. л-ры вядома як Шамірам (у творах арм. гісторыка Маўсеса Харэнацы, 5 — пач. 6 ст. н.э.).

ША́МШУ, Шэмеш, у заходнесеміцкай (палесцінска-ханаанейскай, у т.л. яўрэйскай) стараж. міфалогіі бог сонца. Паводле міфаў, ён кіраваў светам днём, а ноччу ўладарыў месяц. Гэтыя міфы ляглі ў аснову біблейскага ўяўлення аб нябесным воінстве (сонца, месяц, зоркі), створаным Богам на чацвёрты дзень. Культ Ш. існаваў у Іудзеі да сярэдзіны 1-га тыс. да н.э.

В.Шамшур. Бяльмонты. Вячэрнія клопаты. 2000.

ШАМШУ́Р Вячаслаў Вячаслававіч (н. 20.8.1942, в. Пціцкія Міёрскага р-на Віцебскай вобл.), бел. мастацтвазнавец, мастак. Канд. мастацтвазнаўства (1980). Скончыў маст.-графічны ф-т Віцебскага пед. ін-та (1970). З 1970 выкладае ў Віцебскім дзярж. ун-це (з 1986 заг. кафедры, з 1993 праф.). Даследуе гісторыю бел. мастацтва сав. перыяду. Аўтар раздзела ў «Гісторыі беларускага мастацтва» (т.4, 1990), навуч. дапаможнікаў па выяўл. мастацтве. Працуе таксама ў станковай графіцы, у тэхніцы пастэлі і лінарыту: серыі «Дарога на Мёры» (1986—1994), «Віцебск і Віцебшчына» (1988—96); кампазіцыі «Зімовыя карункі» (1986), «Ваколіца» (1988), «Велікодная раніца» (1990), «Праезд праз «Зону» (1991), «Пакроўскі сабор. Вячэрняя літургія» (1996), «Вячэрняе сонца» (1997), «Ранішні туман» (1998), «Бяльмонты. Вячэрнія клопаты» (2000) і інш. Яго графічным работам уласцівы рытмічная раўнавага, выразная пластычная мова, тонкія каларыстычныя інтанацыі.

Тв.: Празднества революции. Мн., 1989.

М.Л.Цыбульскі.

ШАМЯ́КІН Іван Пятровіч (н. 30.1.1921, в. Карма Добрушскага р-на Гомельскай вобл.), бел. пісьменнік, грамадскі дзеяч. Нар. пісьменнік Беларусі (1972). Акад. Нац. АН Беларусі (1994, чл.-кар. 1980). Герой Сац. Працы (1981). Скончыў Гомельскі тэхнікум буд. матэрыялаў (1940), Рэсп. парт. школу пры ЦК КП(б)Б (1950). У 1945—48 настаўнічаў, з 1950 рэдактар Бел. дзярж. выд-ва, з 1952 гал. рэдактар альманаха «Советская Отчизна». З 1954 нам. старшыні, з 1966 сакратар, з 1968 2-і сакратар, з 1971 1-ы нам. старшыні, з 1976 1-ы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі. У 1980—92 гал. рэдактар выд-ва «Беларуская Энцыклапедыя». У 1971—85 Старшыня Вярх. Савета БССР. Друкуецца з 1941 (нарысы і вершы). Першая аповесць — «Помста» (1945). Раман «Глыбокая плынь» (1947—48, Дзярж. прэмія СССР 1951; інсцэніраваны Гомельскім абл. драм. т-рам, 1956) пра падзеі часоў акупацыі і ўсенар. змагання супраць фашыстаў на Гомельшчыне. Асэнсаванне пасляваен. рэчаіснасці ў кн. аповесцей і апавяданняў «На знаёмых шляхах» (1949), «У Маскву» (1950), «Дзве сілы» (1951), «Апавяданні» (1952), «Першае спатканне» (1956), рамане «У добры час» (1953) і інш. У рамане «Крыніцы» (1956, Літ. прэмія імя Я.Коласа 1959; інсцэніраваны Бел. т-рам імя Я.Коласа, 1961) выкрыццё валюнтарысцкіх метадаў кіравання эканомікай, сац. і паліт. жыццём. У пенталогіі «Трывожнае шчасце» («Непаўторная вясна», 1957; «Начныя зарніцы», 1958; «Агонь і снег» і «Пошукі сустрэчы», 1959; «Мост», 1965) лёс герояў асацыруецца з лёсам усяго пакалення, якое прайшло праз цяжкія выпрабаванні вайны, змагаючыся з ворагам на франтах і ў партыз. атрадах, і ў цяжкіх пасляваен. умовах аднаўляла нар. гаспадарку. Надзённыя праблемы жыцця ў зб-ках прозы «Матчыны рукі» (1961), «Вячэрні сеанс» (1968). У раманах «Сэрца на далоні» (1963, разам з «Трывожным шчасцем» Дзярж. прэмія Беларусі імя Я.Коласа 1968; інсцэніраваны Гомельскім і Гродзенскім абл. драм. т-рамі, 1965; Брэсцкім, Магілёўскім, Бел. імя Я.Коласа, Бел. імя Я.Купалы і інш. т-рамі ў 1966) і «Снежныя зімы» (1968, інсцэніраваны т-рам імя Я.Коласа, 1972) праблемы грамадз. адказнасці

Шампіньёны: 1 — двухкольцавы; 2 — палявы; 3 — зграбны; 4 — адасоблены; 5 — звычайны; 6 — лясны; 7 — буйнаспоравы; 8 — пералескавы.

чалавека перад самім сабой, народам, гісторыяй. Апавяд. «Хлеб», аповесці «Першы генерал» (апубл. пад назвай «Лёс майго земляка»), «Браняпоезд «Таварыш Ленін» (абедзве 1970), кінааповесць «Эшалон прайшоў» (1971, кінафільм «Хлеб пахне порахам», 1974), раман «Петраград—Брэст» (1981—83) на гісторыка-рэв. тэму. У раманах «Атланты і карыятыды» (1974, аднайм. відэафільм Бел. тэлебачання, 1980; інсцэніраваны Куйбышаўскім т-рам драмы імя М.Горкага, 1978), «Вазьму твой боль» (1978, аднайм. кінафільм, 1981; Дзярж. прэмія Беларусі 1982) паказ актыўнай пазіцыі сучасніка, яго непрымірымасці да кансерватызму, бюракратызму. Аповесці «Шлюбная ноч» (1975, кінафільм «Вясельная ноч», 1980) і «Гандлярка і паэт» (1976, аднайм. кінафільм, 1978) пра складаныя шляхі людзей з нар. нізоў да актыўнай барацьбы ў гады Вял. Айч. вайны. У рамане «Зеніт» (1987) падзеі апошняга года Вял. Айч. вайны. Аповесці «Ахвяры» (1990), «Падзенне» (1994), раман «Злая зорка» (1991), «Аповесці Івана Андрэевіча» (1993) і інш. пра жыццё Беларусі ў постчарнобыльскі час. У аповесцях «Выкармак» (1996), «Завіхрэнне» (1998), «Пошукі прытулку» (1999), «У засенні палаца», «Стары рамантык», рамане «Губернатар» (усе 2000) і інш. вострая крытыка сац. выдаткаў працэсу капіталізацыі краіны, які прывёў да антыгуманных праяў у грамадстве. Раман «Вялікая княгіня» (1996) на гіст. тэматыку. Майстрам вострага, дынамічнага сюжэта, займальнай інтрыгі выявіў сябе ў драматург. творчасці. Яго п'есы вызначаюцца шырокім падзейна-тэматычным і ідэйна-пафасным дыяпазонам. Творчая манера драматурга эвалюцыяніравала ад распрацоўкі дэтэктыўнапрыгодніцкіх фабул («Не верце цішыні», паст. Бел. рэсп. т-рам юнага гледача, 1958, і інш.) і паказу пераважна знешняй падзейнасці («Дзеці аднаго дома», паст. т-рам юнага гледача, 1967) да ўсебаковага даследавання мікракосмасу грамадства: рэзкай крытыцы падвергнута мяшчанства ў п'есе «Выгнанне блудніцы» (паст. т-рам імя Я.Коласа, 1961, і інш.), праблемы няпростага сталення маладой асобы склалі сэнсава-выяўл. стрыжань п'ес «Экзамен на восень» (паст. т-рам юнага гледача, 1974, Гомельскім т-рам, 1975, і інш.), «Баталія на лузе» (1972, ставілася аматарскімі т-рамі), «Залаты медаль» (паст. Магілёўскім абл. драм. т-рам драмы і камедыі імя В.Дуніна-Марцінкевіча, 1980, і інш.). Псіхал. драма «І змоўклі птушкі» (паст. Брэсцкім т-рам, т-рам імя Я.Купалы, абодва 1977, і інш.) — апалогія чуласці, спагаднасці, душэўнай далікатнасці ва ўзаемаадносінах паміж людзьмі. Літ.-крытычныя артыкулы, выступленні, партрэты знаёмых і сваякоў у кнігах «Размова з чытачом» (1973), «Карэнні і галіны» (1986), аповесці «Слаўся, Марыя» (1999) і інш.

Тв.: Зб. тв. Т.1—5. Мн., 1965—66; Зб. тв. Т.1—6. Мн., 1977—79; Выбр. тв. Т.1—3. Мн., 1992.

Літ.: Гардзіцкі А. Творчасць Івана Шамякіна. Мн., 1971; Каваленка В.А. Іван Шамякін: Нарыс жыцця і творчасці. Мн., 1980. *В.А.Каваленка, С.С.Лаўшук.*

ШАМЯ́КІН Міхаіл Міхайлавіч (26.7.1908, Масква — 26.6.1970), расійскі хімік-арганік, адзін з заснавальнікаў біяарган. хіміі. Акад. АН СССР (1958, чл.-кар. 1953). Герой Сац. Працы (1969). Скончыў Маскоўскі ун-т (1930). З 1930 працаваў у НДІ і ВНУ Масквы. З 1945 у Ін-це біял. і мед. хіміі АМН СССР. У 1959—70 дырэктар Ін-та прыродных злучэнняў АН СССР. Навук. працы па хіміі антыбіётыкаў, вітамінаў і інш. прыродных біялагічна актыўных рэчываў. Прапанаваў метад сінтэзу і тэхналогію прамысл. атрымання леваміцэціну (1953). Сінтэзаваў тэтрацыклін (1966).



І.П.Шамякін.

М.М.Шамякін.

Л.А.Шамяткоў.

Ю.А.Шандалаў.

Тв.: Химия антибиотиков. Т. 1—2. 3 изд. М., 1961 (у сааўт.); Масс-спектрометрическое определение аминокислотной последовательности в пептидах и белках // Современные проблемы химии пептидов и белков. М., 1969.

ШАМЯ́КІНА Таццяна Іванаўна (н. 8.10.1948, Мінск), бел. літаратуразнавец, крытык і перакладчык. Дачка І.П.*Шамякіна*. Д-р філал. н. (2001). Скончыла БДУ (1971), з 1974 выкладае ў ім. Даследуе бел. міфалогію ў кантэксце сусветнай, у сувязі з л-рай і фальклорам, праблемы сучаснай бел. прозы, асаблівасці стылю бел. пісьменнікаў (Я.Коласа, А.Васілевіч, І.Пташнікава, А.Карпюка, М.Стральцова, І.Чыгрынава і інш.). Аўтар манаграфій «На лініі перасячэння» (1981), «Беларуская класічная літаратура і міфалогія» (2001). Сааўтар падручнікаў па бел. л-ры для школ з паглыбленым і профільным вывучэннем бел. л-ры, ліцэяў, каледжаў, гімназій і ВНУ. На рус. мову пераклала творы Шамякіна «Гандлярка і паэт», «Вазьму твой боль», «Залаты медаль», «Петраград—Брэст».

Тв.: Міфалогія Беларусі. Мн., 2000.

ШАМЯНКО́Ў Апанас Дзмітрыевіч (22.2.1896, в. Леніна Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл. — 8.3.1972), Герой Сав. Саюза (1945), ген.-лейтэнант (1945). У арміі з 1915, у Чырв. Арміі з 1918. Скончыў пях. курсы (1919), Аб'яднаную ваен. школу (1927), курсы ўдасканалення каманднага саставу імя Фрунзе (1941), паскораныя курсы (1942) і Вышэйшыя курсы (1950) пры Ваен. акадэміі Генштаба. Удзельнік грамадзянскай вайны 1918—20. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Паўн.-Зах., Паўд.-Зах., 3-м Укр. і 1-м Бел. франтах: камандзір дывізіі, нам. камандуючага арміі па тыле, нам. камандзіра, камандзір корпуса. Удзельнік вызвалення Украіны, Варшаўска-Лодзінскай, Пазнанскай, Берлінскай аперацый. Стралк. дывізія на чале з ген.-маёрам Ш. вызначылася 20.7—1.8.1944 у баях за г. Магнушаў (Польшча). Да 1953 у Сав. Арміі.

ШАМЯТКО́Ў Леанід Аляксандравіч (н. 3.7.1937, г. Гомель), бел. матэматык, стваральнік новага навук. кірунку — тэорыі фармацый алг. сістэм. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1980). Д-р фіз.-матэм. н. (1970), праф. (1973). Акад. Міжнар. АН вышэйшай школы (1993), Бел. акадэміі адукацыі (1994). Засл. дз. нав. Беларусі (1995). Скончыў Гомельскі пед. ін-т (1959). У 1962—77 у Гомельскім аддз. Ін-та матэматыкі АН БССР. Адначасова з 1969 у Гомельскім ун-це (з 1977 прарэктар, у 1989—2000 рэктар). Навук. працы па алгебры, тэорыі графаў, праблемах вышэйшай адукацыі. У тэорыі канечных груп рашыў праблему Г.Віланда аб дапаўняльнасці нармальных падгруп і праблему Дз.К.Фадзеева аб пералічэнні канечных вырашальных груп.

Тв.: Формации конечных групп. М., 1978; Формации алгебраических систем. М., 1989 (разам з А.М.Скібай); Вузовское обучение: Пробл. активизации. Мн., 1989 (у сааўт.).

Літ.: Член-корреспондент Л.А.Шеметков // Атэстацыя. 2002. № 5/6. *М.М.Касцюковіч.*

ШАМЯТО́ЎКА, Шамятоўскі Роў, рака ў Драгічынскім і Кобрынскім р-нах Брэсцкай вобл., правы прыток р. Мухавец (бас. р. Зах. Буг). Даўж. 27 км. Пачынаецца каля в. Меневеж Драгічынскага р-на. Раней выцякала з Мазурскага балота і знікала ў балоце Ель каля в. Кустовічы Кобрынскага р-на. Пасля асушэння балота Ель сцёк з Ш. накіра-

ваны па Скідным канале ў канал Мухавец (Каралёўскі канал). Вусце на У ад в. Акцябр Кобрынскага р-на. Рэчышча каналізаванае.

ША́НАН (Shannon), самая вялікая рака ў Ірландыі. Даўж. 368 км, пл. бас. 15,7 тыс. км^2. Цячэ па Цэнтр. раўніне цераз шэраг азёр (Лох-Ален, Лох-Ры, Лох-Дэрг і інш.). Упадае ў Атлантычны ак., утварае эстуарый (даўж. каля 100 км). Сярэдні расход вады ў ніжнім цячэнні каля 200 м^3/с. Суднаходная ад воз. Лох-Ален. 2 каналамі звязана з г. Дублін. ГЭС. Каля вусця марскі порт Лімерык.

ШАНГІ́Н Барыс Аляксандравіч (н. 10.10.1927, г.п. Ніжнеангарск Паўн.-Байкальскага р-на, Бурацыя), бел. гукааператар. Засл. дз. маст. Беларусі (1979). Скончыў Мінскае муз. вучылішча імя М.Глінкі (1958). З 1960 гукарэжысёр Мінскай студыі тэлебачання, з 1964 гукааператар кінастудыі «Беларусьфільм». Першы на Беларусі ўжыў раздзельны запіс аркестра і салістаў, арк. груп. Сярод агучаных ім фільмаў: «Каханая» (1965), «Саша-Сашачка» (1967), «Чакай мяне, Ганна!» (1969), «Магіла льва» (1972), «Чорная бяроза» (1979, стэрэафанічны), «Пункт адліку» (1980), «Палёт у краіну пачвар» (1986), «Чалавек, які браў інтэрв'ю» (1987), «Звер, які выходзіць з мора» (1992); тэлевізійныя фільмы «Час-Не-Чакае» (1975), «Защішша» (1981), мультыплікацыйны «Песня пра Зубра» (1982), дакумент. «Вялікі тэатр — 200-ы сезон» (1976). *А.А.Карпілава.*

ШАНДА́ЛАЎ Юрый Абрамавіч (10.3.1923, г. Гомель — 16.4.1945), Герой Сав. Саюза (1946). Скончыў курсы мал. лейтэнантаў (1944). У Вял. Айч. вайну на фронце з мая 1942. Стралк. рота на чале з лейт. Ш. 16.4.1945 уклінілася ў абарону праціўніка каля в. Грос-Ноендорф (Германія), адбіла 4 контратакі ворага; у час апошняй контратакі Ш. з 2 байцамі падбіў 2 танкі; апынуўшыся ў акружэнні, адбіваўся да апошняга патрона і загінуў.

ШАНДЗІ́, у стараж.-кіт. міфалогіі і нар. рэлігіі вярх. бажаство. У дзяржаве *Інь* (Шан) у 13—11 ст. да н.э. лічыўся вярх. богам, апекуном дзяржавы і продкам кіруючай дынастыі; пры дынастыі Чжоў (11—3 ст. да н.э.) атаясамліваўся з нябесным уладаром Цяньдзі. У *даасізме* Ш. — вял. продак Дао-шляху. У пач. 12 ст. н.э. імператар Хуэйцзун надаў тытул Ш. вярх. ўладару даоскага і нар. пантэона Нефрытаваму гасудару Юйдзі. Пасля з'яўлення ў Кітаі хрысц. місіянераў тэрмін Ш. ўжываўся ў кіт. перакладах *Біблії* для абазначэння хрысц. паняцця «Бог».

ША́НДРА, шанта (Marrubium), род кветкавых раслін сям. губакветных (яснотковых). Больш за 30 відаў. Пашыраны ў субтропіках Міжземнамор'я і ўмераным поясе Еўразіі. На Беларусі 1 від — Ш. звычайная (M.vulgare). Трапляецца ўздоўж дарог, каля жылля, на сметніках, у пасевах.

Пераважна шматгадовыя густаапушаныя травы. Сцёблы ўзыходныя выш. 15—75 см. Лісце суцэльнае, супраціўнае. Кветкі ружовыя, ліловыя, белыя, жаўтаватыя, сабраныя ў несапраўдныя кальчакі ў пазухах верхняга лісця. Плод — шматарэшак. Лек., фарбавальныя, таніданосныя, эфіраалейныя, меданосныя расліны. *Дз.І.Трацякоў.*

ШАНІ́, вёска ў Пружанскім р-не Брэсцкай вобл., на аўтадарозе Пружаны—Брэст. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 7 км на ПдЗ ад г. Пружаны, 82 км ад Брэста, 19 км ад чыг. ст. Аранчыцы. 436 ж., 163 двары (2003). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці першага старшыні сельсавета І.М.Дыбы, якога ў 1942 загубілі нямф. фашысты.

ША́НКЕР МЯ́ККІ (ад франц. chancre язва), венерычная язва, венерычнае захворванне, узбуджальнік якога стрэптабацыла.

Заражэнне пераважна палавым шляхам. Інкубацыйны перыяд 3—5 дзён. Узбуджальнік укараняецца праз пашкоджаную скуру або слізістую абалонку і пашыраецца па лімфатычных сасудах. У месцы ўкаранення інфекцыі (напр., палавыя органы) з'яўляецца яркачырв. пляма, у цэнтры якой утвараецца гнайнічок. З гнайнічка фарміруецца язва (часцей некалькі) з зубчастымі краямі, мяккая пры пальпацыі (адсюль назва), пры дотыку язва краваточыць. Праз 2—3 мес язва рубцуецца. Ускладненні: *лімфадэніт, лімфангііт* і інш. Лячэнне кансерватыўнае. *І.М.Семяненя.*

ШАНСАНЬЕ́ (франц. chansonnier спявак ад chanson песня), французскі эстрадны спявак, выканаўца жанравых песень, часта аўтар іх слоў і музыкі; таксама любы выканаўца *шансон*. Мастацтва Ш. развівае традыцыі, складзеныя ў паэзіі П.Ж.*Беранжэ*, творчасці П.Дзюпона, Г.Мантэгюса, Э.Піяф, Ш.Азнавура, І.Мантана, М.Мацьё, П.Каас. Выразны рэпертуар Ш. бел. артыста т-ра «Хрыстафор» А.Длускага.



Шандра звычайная.

ША́НСКАЕ НАГО́Р'Е. Размешчана пераважна ва ўсх. ч. М'янмы (б. Бірма), працягваецца на тэр. Кітая, Лаоса і Тайланда. Пл. каля 150 тыс. км^2. Складзена пераважна з гнейсаў, крышт. сланцаў, вапнякоў са шматлікімі праяўленнямі карсту. На З хвалістыя раўніны выш. каля 900 м, на У — складкава-глыбавыя хрыбты выш. да 2693 м, раздзеленыя вузкімі далінамі і каньёнамі рэк Салуін, Меконг і інш. Клімат субэкватарыяльны, мусонны. Сярэднія т-ры студз. 18—24 °С, ліп. да 30 °С. Ападкаў 1300—2000 мм за год. Лістападныя, вечназялёныя і хвойныя лясы, саванны. Радовішчы поліметал. руд.

ШАНСО́Н (ад франц. chanson песня), 1) поліфанічная франц. песня 15—16 ст., якой папярэднічалі *балады*, верыле, *ронда*. Распрацоўвалася франка-флам. кампазітарамі *нідэрландскай школы*; у 16 ст. дасягнула яскравай нац. характарнасці пры ўзмацненні гамафоннага пачатку ў творчасці буйнога прадстаўніка франц. муз. рэнесансу К.Жанекена, а таксама К.Гудымеля, Г.Катле, П.Мулю, К.Сермізі, П.Сертона і інш. У пач. 17 ст. выцеснена гамафоннымі песенна-раманcавымі жанрамі. 2) Франц. песня канца 19 — 20 ст. ва ўсіх яе гіст. і жанравых разнавіднасцях; сучасныя эстр. песні з рэпертуару *шансанье*.

ШАНТА́Ж (франц. chantage вымаганне), прыватны выпадак вымагання. Выяўляецца ў патрабаванні перадачы маёмасці або права на маёмасць ці ажыццяўлення якіх-н. дзеянняў маёмаснага характару пад пагрозай учынення насілля над пацярпелым, яго блізкімі, знішчэння ці пашкоджання іх маёмасці, распаўсюджвання паклёпніцкіх або выдавання інш. звестак, якія захоўваюцца ў тайне. У КК Рэспублікі Беларусь Ш. — таксама сродак учынення інш. злачынства, напр., прымус да дзеянняў сексуальнага характару, да выканання або невыканання пэўнай здзелкі ў галіне прадпрымальніцтва, прымушэнне сведкі, пацярпелага, эксперта да адмаўлення ад дачы паказанняў або дачы заведама ілжывых паказанняў.

Э.І.Кузьмянкова.

ШАНТА́РСКІЯ АСТРАВЫ́, архіпелаг з 15 астравоў у Ахоцкім м., у складзе Хабараўскага краю Расіі. Пл. каля 2,5 тыс. км^2. Найбуйн. а-вы: Вял. Шантар, Фяклістава, М.Шантар і Белічы. Астравы б.ч. гарыстыя (выш. да 701 м). Складзены з пясчанікаў і гліністых сланцаў, прарваных гранітамі. Лістоўнічныя і цемнахвойныя лясы, зараснікі кедравага слаціку.

ШАНТЫ́Р Фабіян Гіляравіч (4.2.1887, г. Слуцк Мінскай вобл. — 29.5.1920), бел. пісьменнік, грамадскі дзеяч, публіцыст. Працаваў хатнім настаўнікам, мулярам, прыватным адвакатам. У 1905—07 за рэв. дзейнасць зняволены. З 1914 у арміі. У 1916—17 удзельнічаў у рабоце клуба «*Беларуская хатка*» ў Мінску. У 1917 адзін з лідэраў левага крыла БСГ, старшыня яго Бабруйскага к-та. Уваходзіў у Бел. нац. к-т і Цэнтр. раду бел.

Ф.Г.Шантыр.

арг-цый і партый. Дэлегат *Усебеларускага з'езда 1917*. У 1918 заг. Смаленскага аддз. Бел. нац. камісарыята, у Слуцкім пав. ваен. камісарыяце. У 1919 камісар па нац. справах *Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі*, у распараджэнні ЦК КП(б) Літвы і Беларусі, у Бел. рэд. калегіі ЦК КП(б)ЛіБ. У 1920 рэпрэсіраваны і прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1992. Друкаваўся з 1909. Пісаў на бел., рус. і польскай мовах. Аўтар рамант., блізкіх да абразкоў-імпрэсій, бессюжэтных апавяданняў («Захар», 1909; «Ноч», «Смерць убогага», абодва 1910, і інш.), вершаў, артыкулаў, публіцыстычнай працы «Беларускае пытанне» (1918, рукапіс не захаваўся). Адзін з аўтараў калект. зб. «Зажынкі» (М., 1918). На бел. мову пераклаў брашуру «Павукі і мухі» В.Лібкнехта.

Тв.: Патрэбнасць нацыянальнага жыцця для беларусаў і самаадзначэння народу. Мн., 1992 [рэпр. выд.: Слуцк, 1918]; У час барацьбы: [Верш у прозе] // Крыніца. 1988. № 11.

Літ.: Якутов В.Д. А.Г.Червяков: Страницы биогр. Мн., 1978. С. 31; Казбярук У.М. Рамантычны пошук. Мн., 1983. С. 40; Стащкевич Н. На пути к истине. Мн., 1983. С. 39; Мяснікоў А. Нацдэмы: Лёс і трагедыя Фабіяна Шантыра, Усевалада Ігнатоўскага і Язэпа Лёсіка. Мн., 1993; Рудовіч С. Час выбару: Прабл. самавызначэння Беларусі ў 1917 г. Мн., 2000.

І.У.Саламевіч, В.У.Скалабан.

ШАНХА́Й, найбуйнейшы горад на У Кітая. Яго тэр. з прылеглымі раёнамі (6,2 тыс. км^2) вылучана ў самастойную адм. адзінку цэнтр. падпарадкавання. Нас. 9,862 млн. ж. (2000). Важны трансп. вузел. 2 аэрапорты. Найбуйн. марскі порт краіны (пераважна знешнегандл. грузы) у эстуарыі р. Янцзы, на яе правым прытоку р. Хуанпу, за 50 км ад Усх.-Кітайскага мора. У Ш. вырабляецца $^1/_6$ усёй прамысл. прадукцыі Кітая. Прам-сць: шматгаліновае машынабудаванне, у т.л. радыёэлектроннае, суднабудаванне, чорная і каляровая металургія, хім., лёгкая (асабліва тэкст.), фармацэўтычная, паліграф., папяровая, тытунёвая, харчовая. Разнастайныя саматужныя вытворчасці. 45 ВНУ (2001).

Вырас з рыбацкага пасёлка Хуту, які вядомы са старажытнасці. У 16 ст. — гандл. і рамесны цэнтр. Паводле *Нанкінскага дагавора 1842* адкрыты для замежнага гандлю: у 1843 створаны англ., у 1848 амер. *сетльменты*, у 1849 — франц. канцэсія. У 1854 Вялікабрытанія, Францыя, ЗША захапілі і кіравалі (да 1937) шанхайскай мытняй. У 1860 і 1862 у час *Тайпінскага паўстання* ў прадмесці Ш. ішлі баі паміж паўстанцамі і англа-франц. войскамі. З 2-й пал. 19 ст. Ш. — найбуйнейшы гандл. і прамысл. цэнтр Кітая. З 1919 адзін з гал. цэнтраў нац.-вызв. руху. У 1937—45 акупіраваны яп. войскамі. З 1945 пад уладай гаміньданаўцаў. Вызвалены ў 1949 Нар.-вызв. арміяй Кітая.

ША́НЦАВЫ ІНСТРУМЕ́НТ (ад ням. Schanze акоп, земляное ўмацаванне), табельны (прадугледжаны паводле штату) інструмент (лапаты, сякеры, кіркаматыкі, пілы папярочныя, ламы, трасіровачныя шнуры), які выкарыстоўваецца войскамі для самаакопвання асабовага складу ў баі, узвядзення *фартыфікацыйных збудаванняў* і мастоў, пры стварэнні загарод і інш. Падзяляецца на інструмент, які носяць (уваходзіць у асабісты рыштунак салдата), і той, які возяць у камплекце баявых і трансп. машын.

Шанхай. Гандлёва-фінансавая зона Луцзяцзуй.

ШАНЬДУ́Н, Шаньдунскі паўвостраў. Размешчаны на У Кітая, удаецца ў Жоўтае м. на 350 км. Берагі парэзаны залівамі і бухтамі. Узгоркі і горы (выш. да 923 м) укрыты хмызняком; раўніны густа населены. Вырошчваюць пшаніцу, арахіс, тытунь, садавіну. Парты — Цындао, Яньтай.

ШАНЬДУ́Н, правінцыя на У Кітая, на аднайм. паўвостраве і часткова на Вял. Кітайскай раўніне. Пл. 153 тыс. км^2. Нас. 90,4 млн. чал. (2001). Адм. ц. — г. *Цзінань*. Цэнтр. ч. займаюць Шаньдунскія горы (выш. да 1524 м), акаймаваныя Вял. Кітайскай раўнінай. Клімат умераны, мусонны. Сярэдняя т-ра студз. ад -1,3 да -1,6 °С, ліп. 24—28 °С, ападкаў 600—1000 мм за год. Найб. рэкі Хуанхэ (ніжняе цячэнне) і Вэйхэ. Лясы высечаны, у гарах невял. гаі з хвоі, дубу, клёну. Ш. — індустр.-агр. раён Кітая. Здабыча каменнага вугалю, нафты, жал. руды, баксітаў, графіту. Прам-сць: чорная і каляровая металургія, машынабудаванне (у т.л. станка-, судна- і вагонабудаванне, вытв-сць абсталявання для тэкст. прам-сці), электронная, хім. і нафтахім., лёгкая, харч., фарфора-фаянсавая. Выпрацоўка электраэнергіі пераважна на ЦЭС. Вырошчваюць пшаніцу, рыс, проса, гаалян, кукурузу, бабовыя, з тэхн. — бавоўнік, арахіс, тытунь. Садоўніцтва. Вінаградарства. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, аслоў, свіней, авечак, коз, коней. Птушкагадоўля. Рыбалоўства і марскія промыслы. Суднаходства па рэках Хуанхэ, Сяцынхэ і Вял. канале. Марскія парты: Цындао, Яньтай, Вэйхай, Шыдао.

ШАНЬКО́ Георгій Георгіевіч (н. 1.7.1936, г. Навагрудак Гродзенскай вобл.), бел. вучоны ў галіне дзіцячай неўралогіі; заснавальнік навукова-практычнай школы дзіцячых неўролагаў Беларусі. Д-р мед. н. (1974), праф. (1985). Засл. дз. нав. Беларусі (1995). Гал. дзіцячы неўролаг Беларусі (1970—2002). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1958). З 1965 у Бел. НДІ неўралогіі, нейрахірургіі і фізіятэрапіі (з 1973 нам. дырэктара па навук. рабоце). З 1980 у Бел. мед. акадэміі паслядыпломнай адукацыі (у 1987—99 прарэктар па лячэбнай рабоце). У 1997—2002 старшыня вучонага мед. савета Мін-ва аховы здароўя Беларусі. Навук. працы па гіперкінезах, эпілепсіі; стварыў (з А.У.*Руцкім*) новы кірунак у дзіцячай неўралогіі і артапедыі па спалучаных і ўзаемазвязаных пашкоджаннях.

Тв.: Генерализованный тик (болезнь Жиль де ля Туретта) у детей и подростков. Мн., 1979; Энциклопедия детского невролога. Мн., 1993 (у сааўт); Эпилепсия у детей: классификация, диагностика, лечение. Мн., 1997.

ШАНЬСІ́, правінцыя на Пн Кітая, у бас. сярэдняга цячэння р. Хуанхэ. Пл. 156 тыс. км^2. Нас. 32,7 млн. чал. (2001). Адм. ц. — г. *Таюань*. Размешчана на Шаньсійскім плато (ч. *Лёсавага плато*), на У — зах. схілы гор Тайханшань. Клімат умераны, мусонны. Сярэдняя

т-ра студз. ад -16 °С на Пн да -2 °С на Пд, ліп. ад 20 да 25 °С. Ападкаў 400—500 мм за год. Гал. р. Фыньхэ (прыток р. Хуанхэ). Расліннасць на З і ПнЗ пераважна паўпустынная, на У — мяшаныя і шыракалістыя лясы (у гарах). Гаспадарка прамысл.-агр. тыпу. Асн. галіны прам-сці: вугальная (Датунскі, Янцюаньскі, Сітаньскі бас.), металургічная, машынабудаванне (цяжкае, с.-г., тэкст.), хім. (сода, к-та, сера), лёгкая, харч. (алейная, мукамольная, вінаробная). Рамёствы (метал., фарфаравыя вырабы, дываны). Тэр. Ш. — страж. земляробчы раён Кітая. Вырошчваюць пшаніцу, чумізу, гаалян, кукурузу, авёс, бавоўнік, кунжут, лён, цукр. буракі. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, аслоў, мулаў, свіней, авечак (у горных раёнах). Гал. гарады: Таюань, Датун, Янцюань, Чанчжы, Юйцы.

ШАНЬТО́Ў, Сватоў, горад на ПдУ Кітая, у прав. Гуандун. 579 тыс. ж. (1990). Порт у дэльце р. Ханьцзян на Паўд.-Кітайскім моры. Важны прамысл. цэнтр. Прам-сць: машынабудаванне, хім., гумавая, тэкст., харчасмакавая; вытв-сць запалак. Рамёствы. Рыбалоўства.

ШАНЬХАЙГУА́НЬСКІ ПРАХО́Д, вузкая паласа нізін уздоўж зах. ўзбярэжжа Ляадунскага зал. Жоўтага м., у Кітаі. Даўж. каля 200 км, шыр. да 25 км. Гал. шлях, які злучаў Паўн.-Усх. Кітай і Вял. Кітайскую раўніну на працягу стагоддзяў. Па Ш.п. праходзяць чыгунка і шаша Пекін—Шэньян. Ад Ш.п. пачынаецца *Вялікая Кітайская сцяна*.



Да арт. **Шанцавы інструмент**: 1 — вялікая сапёрная лапата; 2 — сякера; 3 — пяхотная лапата; 4 — кіркаматыка; 5 — лом; 6 — папярочная піла; 7 — трасіровачны шнур.

ШАН ЯН (390—338 да н.э.), старажытнакітайскі дзярж. дзеяч, адзін з заснавальнікаў легісцкай школы (фацзя). З 361 да н.э. служыў саветнікам цыньскага правіцеля Сяо Гуна. У 359—348 да н.э. правёў рэформы, паводле якіх умацавана цэнтр. ўлада, узаконена права прыватнай уласнасці на зямлю, уведзена сістэма кругавой парукі ў вёсках, арыстакратыя пазбаўлена права атрымліваць у спадчыну адм. пасады і ўладанні. Рэформы выклікалі незадаволенасць арыстакратыі і Ш.Я. пакараны смерцю. Пасля аб'яднання Кітая царствам *Цынь* (221 да н.э.) пераўтварэнні Ш.Я. былі пашыраны на ўсю дзяржаву.

ШАНЯЎСКАГА УНІВЕРСІТЭ́Т, Маскоўскі гарадскі народны універсітэт імя А.Л.Шаняўскага, грамадская навучальная і навук. ўстанова ў Маскве ў 1908—20. Засн. на сродкі ліберальна настроенага золатапрамыслоўца, ураджэнца Падляшша (родавы маёнтак Шанявы), адстаўнога ген.-маёра А.Л.Шаняўскага (22.2.1837—20.11.1905) з удзелам яго ўдавы Л.А.Шаняўскай і кнігавыдаўца М.В.Сабашнікава. Адчынены 15.10.1908, знаходзіўся ў падпарадкаванні Маскоўскай гар. думы па-за сістэмай устаноў Мін-ва нар. асветы. Меў 2 аддзяленні: навук.-папулярнае (4-гадовае навучанне ў аб'ёме сярэдняй навуч. установы для асоб з элементарнай адукацыяй) і акадэмічнае (3-гадовае навучанне ў аб'ёме ун-та для асоб з сярэдняй адукацыяй). Заняткі адбываліся ў вячэрні час. Выкладчыкі — буйныя вучоныя, якія з-за сваіх паліт. поглядаў не маглі выкладаць у дзярж. ВНУ, у іх ліку П.М.*Лебедзеў*, М.К.*Кальцоў*, А.Я.*Ферсман*, М.М.*Лукін* і інш. Хоць выпускнікі ун-та не атрымлівалі дыпломаў, колькасць яго навучэнцаў на акад. аддзяленні вырасла з 964 чал. у 1908—09 да 2966 у 1915—16, на навук.-папулярным аддзяленні — з 342 чал. у 1910—11 да 1469 у 1915—16. Пры ун-це дзейнічалі курсы па падрыхтоўцы работнікаў кааперацыі, бібліятэчнай справы, самакіравання і інш. Сярод навучэнцаў Ш.у. былі беларусы Я.*Купала*, А.У.*Канчэўскі* і інш. 20.8.1919 акад. аддзяленне Ш.у. ўлілося ў Маскоўскі дзярж. ун-т, навукова-папулярнае 1.11.1920 аб'ядналася з рабочым ф-там Камуніст. ун-та імя Свярдлова.

ШАПАВА́ЛАЎ Іван Еўдакімавіч (26.1.1907, с. Бежаўка Бурынскага р-на Сумскай вобл., Украіна — 26.6.1941), бел. пісьменнік. Скончыў камвну ў Мінску (1933). З 1923 у Чырв. Арміі; у 1925—39 служыў на Беларусі ў пагранвойсках. З 1940 працаваў у час. «Пограничник». У пачатку Вял. Айч. вайны быў у камандзіроўцы ў пагранвойсках Беларусі, загінуў пры бамбардзіроўцы каля г. Барысаў (Мінская вобл.). Друкаваўся з канца 1920-х г. Пісаў на рус. мове. У аповесці «Бальшавікі граніцы» (1936), зб-ках вершаў «Таварыш» (1932), «Дзяржынцы» (1934), «...Час набліжаецца...» (1937), паэме-аповесці «Ян Рэндзя» (1932) і інш. жыццё пагранічнікаў. Аўтар лібрэта оперы «Пагранічнікі» (муз. А.Туранкова). «Песню пагранічнікаў» на словы Ш. напісаў С.Палонскі.

Тв.: Ненадуманные рассказы. Мн., 1939.

І.Э.Багдановіч.

ШАПАВА́ЛАЎ Ігар Аляксеевіч (н. 3.12.1945, г. Джалал-Абад, Кыргызстан), расійскі артыст балета, балетмайстар, педагог. Нар. арт. СССР (1985). Скончыў Фрунзенскае муз.-харэаграфічнае (1961) і Пермскае харэаграфічнае (1963; у 1967—85 выкладчык у ім) вучылішчы. З 1963 у Пермскім т-ры оперы і балета. З 1989 гал. балетмайстар і маст. кіраўнік «Маскоўскага балета на лёдзе». Танцоўшчык характарнага плана. Сярод роляў: Дырыжор, Чорт («Бераг надзеі», «Стварэнне свету» А.Пятрова), Тыбальд («Рамэо і Джульета» С.Пракоф'ева), Харон («Арфей і Эўрыдыка» на музыку А.Журбіна), Візір («Легенда пра каханне» А.Мелікава). Ставіў танцы ў операх, канцэртныя нумары і інш.

ШАПАВА́ЛЬСТВА, шапавальнае рамяство, выраб з воўны (валенне, качанне) галаўных убораў, валёнак, лямцу. На Беларусі развіта з сярэдневякоўя. У 16—17 ст. у гарадах існавалі рамесныя прафесіі магерачніка, шапавала. Валеныя *магеркі* і *брылі* былі пашыраным галаўным уборам бел. сялян. У 19 ст. шапавалы пачалі валяць і зімовы абутак — валёнкі, а таксама лямец для конскай вупражы. Асабліва пашырылася Ш. на У Беларусі. На Магілёўшчыне ў 1880-я г. гэтым саматужным промыслам займаліся сяляне Чавускага, Мсціслаўскага, Рагачоўскага, Магілёўскага, а таксама Рэчыцкага (в. Кабылеў) і інш. паветаў. Найб. развіццё промысел атрымаў у Дрыбінскай вол. Чавускага пав. (мястэчка Дрыбін і 12 навакольных вёсак). Пераважала Ш. ў форме адыходнага промыслу. Майстры працавалі ў дамах заказчыкаў, пераходзячы з вёскі ў вёску са сваімі прыладамі працы (брында для рыхлення воўны, драўляныя і жал. качалкі для раскочвання лямцу, правідлы для надання вырабу патрэбнай формы, жал. шчоткі для расчэсвання ворсу). Дрыбінскія шапавалы ў час адыходніцтва карысталіся ўмоўнай мовай — т.зв. катрушніцкі лемезень. У пач. 20 ст. лямцавыя магеркі і брылі выйшлі з ужытку, таму змяніліся маштабы шапавальнага рамяства і тыпалогія валеных вырабаў. Пашырыўся выраб валёнак, асабліва дзіцячых; бытуе і ў наш час. Мясц. майстры вырабляюць валёнкі на свае патрэбы і на заказ, выкарыстоўваюць традыц. тэхналогію і прылады працы.

Н.І.Буракоўская.

ШАПАТО́ВІЧЫ, група археал. помнікаў (2 гарадзішчы і 2 паселішчы) каля в. Шапатовічы Чачэрскага р-на Гомельскай вобл. Гарадзішча-1 *мі-*

лаградскай культуры і *зарубінецкай культуры* мае пляцоўку прамавугольнай формы з закругленымі вугламі (60×45 м); па краі прасочваецца вал выш. 1,2—1,5 м. Абследавалі А.М.Ляўданскі (1928), В.М.Мельнікоўская (1956), М.А.Ткачоў (1976). У 1979 і 1982 раскопкі праводзіў А.І.Драбушэўскі. Выяўлена пабудова слупавой канструкцыі з агнішчам у выглядзе скопішча абпаленай гліны і гасп. ямы. Знойдзены гліняныя прасліцы і грузікі, сярэднелатэнскія і позналатэнскія фібулы, фрагмент бронзавага бранзалета, вырабы з жалеза, каляровых металаў, косці, каменю, фрагменты грубаляпной і глянцавай керамікі. Гарадзішча-2 — 2 ст. да н.э. — 3 ст. н.э. Пляцоўка авальная (50×40 м), узвышаецца на 3—4 м над поплавам р. Сож. Абследавалі С.А.Булінскі (1928) і Ткачоў (1976). У агаленнях пляцоўкі сабрана ляпная кераміка. Паселішчы 1 і 2 належалі носьбітам *верхнедняпроўскай культуры*. Першае датуецца 4-м тыс. да н.э., другое — 3-м тыс. да н.э. Выяўлены К.М.Палікарповічам (1926), даследавалі І.І.Арцёменка (1965) і А.Г.Калечыц (1976). Знойдзены кераміка з ямкава-грабеньчатым арнаментам, крамянёвыя скрэблы, нажы, сякеры, наканечнікі стрэл і інш.

ШАПА́ЧКА (Verpa), род сумчатых грыбоў-дыскаміцэтаў сям. гельвелавых. 5 відаў. Пашыраны ў Еўразіі. На Беларусі 1 від — Ш. смаржковая (V.bohemica). Трапляецца ў крас. — чэрв. і вер. ў светлых лісцевых лясах.

Шапачка смаржковая.

Шапка дыям. 2—3 см, званочкападобная, маршчакаватая, жаўтавата-карычневая, знізу белаватая, на верхавінцы прыросласа да ножкі, краі свабодныя. Мякаць тонкая, воскападобная, з непрыемным пахам. Ножка цыліндрычная, полая, белая, з лускавінкамі. Споры авальныя, гладкія, жаўтаватыя. Умоўна ядомы грыб.

ША́ПАШНІК Барыс Львовіч (17.12.1902, г. Пінск Брэсцкай вобл. — 12.9.1985), бел. інжынер, канструктар грузавых аўтамабіляў і спец. тэхнікі. Д-р тэхн. н. (1983). Герой Сац. Працы (1973). Засл. дз. нав. і тэхн. Беларусі (1962). Засл. работнік прам-сці Беларусі (1972). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча (1930). З 1929 на аўтамаб. з-дах Расіі. З 1949 на Мінскім аўтамаб. з-дзе (з 1954 начальнік СКБ-1), стваральнік першага 25-тоннага кар'ернага самазвала МАЗ-525, аднавосевага цягача МАЗ-529 і шматвосевых колавых шасі. Распрацоўшчык сям'і 4- і 6-восевых цягачоў, здольных несці ракетныя комплексы. Пад яго кіраўніцтвам створаны эксперым. МАЗ-7907 з газатурбінным рухавіком магутнасцю 1200 к.с. Ленінская прэмія 1976. Дзярж. прэмія СССР 1968.

Літ.: Шугуров Л. Закрытый конструктор Борис Шапошник // За рулем. 1997. № 5; Чвялев В.Е. Б. Л. Шапошник: (к 100-летию со дня рождения) // Автомобильная промышленность. 2002. № 12. *М.М.Касцюковіч.*

ША́ПАШНІКАЎ Барыс Міхайлавіч (2.10.1882, г. Златауст Чэлябінскай вобл., Расія — 26.3.1945), савецкі ваен. дзеяч. Маршал Сав. Саюза (1940). Праф. (1935). Скончыў маскоўскае ваен. вучылішча (1903) і Акадэмію Генштаба (1910). У арміі з 1901, удзельнік 1-й сусв. вайны. У Чырв. Арміі з 1918. У грамадз. вайну пам. нач. аператыўнага ўпраўлення Вышэйшага ваен. савета, нач. аператыўнага ўпраўлення Палявога штаба РВС Рэспублікі. Пасля грамадз. вайны 1-ы пам. нач. штаба РСЧА, у 1925—28 і 1935—37 камандуючы ваен. акругамі. У 1932—35 нач. і ваен. камісар Ваен. акадэміі імя Фрунзе. У 1937—40, 1941—42 нач. Генштаба Чырв. Арміі, 1940—43 нам. наркома абароны СССР. З чэрв. 1943 нач. Ваен. акадэміі Генштаба. Канд. у чл. ЦК ВКП(б) з 1939. Дэп. Вярх. Савета СССР з 1937. Аўтар ваенна-тэарэт. прац.

Тв.: На Висле. М., 1924; Мозг армии. Кн. 1—3. М., 1927—29; Воспоминания: Воен.-науч. тр. М., 1974.

Літ.: Захаров М.В. Ученый и воин. 2 изд. М., 1978; Василевский А.М. Маршал Б.М.Шапошников // Воен.-ист. журн. 1972. № 9.

ША́ПАШНІКАЎ Уладзімір Мікалаевіч (24.2.1884, Масква — 23.10.1968), расійскі вучоны ў галіне мікрабіялогіі; адзін з заснавальнікаў тэхн. мікрабіялогіі ў СССР. Акад. Рас. АН (1953). Скончыў Маскоўскі ун-т (1910), дзе і працаваў. У 1938—63 у Ін-це мікрабіялогіі Рас. АН. Навук. працы па фізіялогіі мікраарганізмаў, шляхах эвалюцыі асн. тыпаў браджэння. Заклаў асновы прамысл. вытв-сці малочнай і алейнай к-т, ацэтону, бутылавага спірту і інш. Дзярж. прэмія СССР 1950.

ШАПЕ́ЛІН Алег Паўлавіч (н. 12.8.1929, г. Раднікі Іванаўскай вобл., Расія), расійскі і бел. вучоны ў галіне гігіены, фізіялогіі працы і прафпаталогіі. Д-р мед. н. (1972), праф. (1973). Скончыў Ленінградскі сан.-гігіенічны мед. ін-т (1953). З 1962 ва Уладзівастоцкім мед. ін-це, Далёкаўсходнім філіяле НДІ працы. З 1978 у Віцебскім мед. ун-це (у 1978—98 заг. кафедры). Навук. працы па фізіёлага-гігіенічнай ацэнцы шумоў, гігіене працы ў прам-сці, навучальна-метадалагічных праблемах мед. адукацыі.

Тв.: Гигиена труда в судоремонтной промышленности. М., 1979; Урбанизация и здоровье. М., 1991.

Б.М.**Шапашнікаў**.

Ф.Л.**Шапіра**.

ШАПЕНГА́ЎЭР (Schopenhauer) Артур (22.2.1788, г. Гданьск, Польшча — 21.9.1860), нямецкі філосаф, прадстаўнік *валюнтарызму* і ірацыяналізму. Вучыўся ў Гётынгенскім і Берлінскім ун-тах. З канца 1820-х г. жыў у г. Франкфурт-на-Майне і займаўся навук. працай. На светапогляд Ш. паўплывалі ідэі І.*Канта, Платона*, будызму. Базавыя паняцці распрацаванай ім філас. сістэмы — *воля* і *ўяўленне*. Абсалютная воля, на думку Ш., «драбіцца» і рэалізуецца ў бясконцым мноства «аб'ектывацый», кожная з якіх імкнецца заняць пануючае становішча; у выніку назіраецца вайна ўсіх супраць усіх, а сусв. працэс зводзіцца да выяўлення стыхійнай сілы — «волі да жыцця». Лічыў, што ўяўленні ў адрозненне ад абсалютнай волі — гэта свет нашага вопыту; усе навакольныя з'явы — толькі сукупнасць пачуццёва-інтуітыўных уяўленняў суб'ектаў. Паводле Ш., спасцігнуць свет з'яў можна з дапамогай *дастатковай падставы прынцыпу*. Сац. быццё трактаваў песімістычна, падкрэсліваў непазбежнасць нягод, барацьбы, пакут, якія выцякаюць з самой прыроды «волі да жыцця», таму лічыў неабходным асэнсавана стаць на пазіцыю аскетызму ў адносінах да сябе і альтруізму ў адносінах да іншых. Ідэі Ш. сталі адной з тэарэт. крыніц *філасофіі жыцця*. Сугучныя Ш. ідэі распаўсюдзіліся на Беларусі ў пач. 20 ст. і былі абумоўлены паражэннем рус. рэвалюцыі 1905—07, але часткай інтэлігенцыі ўспрымаліся крытычна [напр., бел. паэт Я.Лучына (І.Л.Неслухоўскі) ў процівагу вучэнню Ш. адстойваў на старонках «Минского листка» ідэю *прагрэсу*].

Тв.: Рус. пер. — Полн. собр. соч. Т.1—4. М., 1900—10; Собр. соч. Т.1—6. М., 1999—2001.

Літ.: Быховский Б.Э. Шопенгауэр. М., 1975. *Т.І.Адула.*

ШАПЕ́ЧЫНА, вёска ў Віцебскім р-не, на р. Сухадроўка, на аўтадарозе Віцебск—Орша. Цэнтр сельсавета і калгаса-камбіната. За 25 км на Пд ад Віцебска. 352 ж., 149 двароў (2003). Пач. школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі.

ШАПІ́ЛАЎ Дзмітрый Трафімавіч (5.11.1905, Ашгабат — 18.8.1995), савецкі дзярж. і парт. дзеяч, вучоны-эканаміст. Чл.-кар. АН СССР (1953), праф. (1939), ген.-маёр (1945). Скончыў Маскоўскі ун-т (1926), Аграрны ін-т чырв. прафесуры (1934). У 1920—30-я г. ў пракуратуры, на гасп., навук. і выкладчыцкай рабоце. У Вял. Айч. вайну чл. ваен. савета арміі. З 1946 у апараце ЦК КПСС. У 1952—56 гал. рэдактар газ. «Правда», у 1955—57 сакратар ЦК КПСС, у 1956—57 міністр замежных спраў СССР. Удзельнік рэабілітацыі ахвяр паліт. рэпрэсій, дапамагаў М.С.*Хрушчову* рыхтаваць даклад да XX з'езда КПСС (1956). На чэрвеньскім пленуме ЦК КПСС (1957). крытыкаваў Хрушчова за парушэнні прынцыпаў калект. кіраўніцтва і некампетэнтнасць, за што штучна прылічаны да т.зв. антыпарт. групы і адхілены ад усіх парт. і дзярж. пасад. З 1957 дырэктар Ін-та эканомікі АН Кіргізіі, у 1960—82 у Гал. архіўным упраўленні пры СМ СССР. Кіраўнік аўтарскага калектыву падручніка «Палітычная эканомія» (1954).

Літ.: И примкнувший к ним Шепилов: Правда о человеке, ученом, воине, политике. М., 1998. *Ю.В.Бажэнаў.*

ШАПІ́РА Барыс Міронавіч (н. 20.3.1930, в. Журавічы Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1990), праф. (1991). Акад. Міжнар. акадэміі інфарм. працэсаў і тэхналогій (1996). Засл. работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1995). Бацька С.Б.*Шапіры*. Скончыў Гомельскі педінстытут (1953). Настаўнічаў. З 1963 старшыня калгаса ў Любанскім р-не. У 1973—2002 заг. сектара, заг. аддзела Бел. НДІ агр. эканомікі. Навук. працы па праблемах с.-г. вытв-сці, рэфармавання АПК Беларусі.

Тв.: Резервы эффективности использования техники. Мн., 1980; Организация труда в условиях индустриализации сельскохозяйственного производства. Мн., 1982; Коллективный подряд в агропромышленном комплексе. Мн., 1985; Коллективный подряд и арендные отношения в сельском хозяйстве. Мн., 1989; Агропромышленный комплекс в условиях перехода к рынку. Мн., 1997 (у сааўт.); Основные направления реформирования сельскохозяйственных предприятий // Весці Акадэміі агр. навук Рэспублікі Беларусь. 1999. № 4; Курсом аграрных реформ. Мн., 2001 (у сааўт.).

ШАПІ́РА Майсей Навумавіч (14.4.1884, Мінск — 29.6.1970), бел. хірург, траўматолаг, артапед. Д-р мед. н., праф. (1939). Засл. дз. навук Беларусі (1940). Скончыў Казанскі ун-т (1909). У 1927—41, 1945—57 у Мінскім мед. ін-це, адначасова ў 1930—41 у клініцы артапедыі і траўматалогіі Бел. НДІ фтызіятрыі, артапедыі і неўралогіі (у 1945—50 дырэктар). Працы па пытаннях хірургіі, траўматалогіі, артапедыі.

Тв.: Эпидемический детский паралич. 2 изд. Мн., 1957 (разам з М.А.Хазанавым).

ШАПІ́РА Сямён Барысавіч (н. 17.6.1961, в. Рачэнь Любанскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1999), Акад. Міжнар. акадэміі інфарм. працэсаў і тэхналогій (2000), чл.-кар. Бел. інж. акадэміі (1997). Сын Б.М.*Шапіры*. Скончыў Бел. ін-т нар. гаспадаркі (1983). З 1983 на гасп. рабоце ў АПК Беларусі, з 1989 старшыня калгаса ў Дзяржынскім р-не. З 1999 нач. Гал. ўпраўлення эканомікі, з 2002 дырэктар Дэпартамента эканомікі Мін-ва сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь. Навук. працы па праблемах кіравання і рэфармавання АПК Беларусі ва ўмовах рыначнай эканомікі.

Тв.: Управление в агропромышленном комплексе при рыночных отношениях. Мн., 1998; Основы управления аграрным сектором в условиях рынка: (Теория, методология и практ. рекомендации). Мн., 1999; Механизм рыночного развития агропромышленного комплекса Беларуси. Мн., 2000 (у сааўт.); Реформирование агропромышленного комплекса. Мн., 2002 (у сааўт.).

ШАПІ́РА Фёдар (Файвіш) Львовіч (6.4.1915, г. Віцебск — 30.1.1973), савецкі фізік-ядзершчык. Чл.-кар. АН СССР (1973), д-р фіз.-матэм. н. (1962), праф. (1967). Скончыў Маскоўскі ун-т (1941). З 1945 у Фіз. ін-це АН СССР, з 1958 у Аб'яднаным ін-це ядз. даследаванняў у г. Дубна (з 1959 нам. дырэктара Лабараторыі нейтроннай фізікі). Навук. працы па фізіцы рэактараў, ядз. і нейтроннай фізіцы. Прапанаваў метад адваротнай геаметрыі для вывучэння няпругкіх узаемадзеянняў павольных нейтронаў з кандэнсаванымі асяроддзямі (1961). Пацвердзіў эфект поўнага адбіцця ультрахалодных нейтронаў пры любых вуглах падзення (1968). Дзярж. прэмія СССР 1971.

Тв.: Нейтронные исследования: Собр. трудов. М., 1976; Физика нейтронов: Собр. трудов. М., 1976.

Літ.: Ф.Л.Шапиро: человек и ученый: Книга воспоминаний. Дубна, 1998; Пикельнер Л.Б., Стрелков А.В. Ф.Л.Шапиро // Ядерная физика. 2000. Т. 63, № 4.
М.М.Касцюковіч.

ШАПІТО́ (франц. chapiteau літар. — капітэль, каўпак), часовае цыркавое памяшканне для дэманстрацыі спектакляў. Звычайна — купалападобны брызентавы шацёр, які нацягваецца з дапамогай розных мацаванняў на высокія мачты (формы) і бакавыя стойкі. Унутры Ш. знаходзяцца манеж, месцы для гледачоў, неабходныя тэхн. прыстасаванні і закулісная частка. Хутка збіраецца і разбіраецца. Прызначаны пераважна для раз'язнога абслугоўвання гледачоў (перасовачныя цыркі-Ш.). Стацыянарныя Ш. ствараюць у гарадах, дзе няма пастаянных цыркавых будынкаў, у садах, парках у летні перыяд (летнія цыркі-Ш.). Узніклі ў 1830-я г. (Летні цырк, Елісейскія палі, Парыж). Пашырыліся ў ЗША і інш. краінах свету. У Расіі першае Ш. адкрыта ў 1830 у Маскве, на Беларусі — у 1947 у Мінску, у 1950—60-я г. перасовачныя цыркі-Ш. працавалі ў Гомелі.

Літ.: Кузнецов Е.М. Цирк. 2 изд. М., 1971.

ШАПІ́ЦЬКА Ларыса Яфімаўна (6.1.1938 — 2.7.1979), расійскі кінарэжысёр. Засл. дз. маст. Расіі (1974). Скончыла Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1963). Першыя фільмы «Спякота» (1963, прэмія Міжнар. кінафестывалю ў Карлавых Варах, 1964) і «Крылы» (1966) выявілі яе аўтарскі почырк — цікавасць да чалавека ў экстрэмальнай, крызіснай сітуацыі, фактурнасць выяўл. рашэнняў. Арыгінальнасцю драматург. прынцыпаў адзначана стужка «Ты і я» (1972). У фільме «Узыходжанне» паводле аповесці В.Быкава «Сотнікаў» (1977, гал. прэмія і прэмія Міжнар. асацыяцыі кінапрэсы на Міжнар. кінафестывалі ў Зах. Берліне) на ваен. матэрыяле даследавала тэму прызначэння чалавека, яго духоўных магчымасцей. Зняла фільмы тэлевізійны «А трынаццатай гадзіне» і кароткаметражны «Радзіма электрычнасці» (абодва 1968). Пра яе мастацтва зняты дакумент. фільм «Ларыса» (1980, рэж. Э.Клімаў). Дзярж. прэмія СССР 1979.

Літ.: Лариса. М., 1987. *Г.У.Шур.*

ША́ПКА МАНАМА́ХА, залаты філігранны галаўны ўбор сярэднеазіяцкай работы 14 ст., з сабалінай апухай, упрыгожаны каштоўнымі камянямі і ўвянчаны крыжам; рэгалія маскоўскіх вял. князёў і рас. цароў, сімвал самадзяржаўя ў Расіі. У канцы 15— пач. 16 ст. набыла вядомасць легенда аб візант. паходжанні Ш.М., якую нібыта прыслаў імператар Канстанцін Манамах свайму

Шапка Манамаха.

ўнуку вял. кн. кіеўскаму *Уладзіміру Манамаху*. Гэтая легенда выкарыстана пры стварэнні паліт. тэорыі «Масква — трэці Рым». Ш.М. з канца 15 ст. вянчалі (каранавалі) пры ўступленні на прастол маскоўскіх вял. князёў, а ў 16—17 ст. рас. цароў. З 1724 ў якасці каранацыйнага вянца выкарыстоўвалася імператарская карона. Ш.М. зберагаецца ў *Аружэйнай палаце* ў Маскве.

ШАПКО́ Эдуард Пятровіч (13.6.1903, г. Ліепая, Латвія — 28.10.1977), бел. акцёр. Засл. арт. Беларусі (1946). У 1922—59 у Бел. т-ры імя Я.Купалы, дзе сфарміраваўся як акцёр пад кіраўніцтвам Е.*Міровіча*. Характарны і камед. акцёр. Яго мастацтва вылучалася сакавітасцю сцэн. фарбаў, дэталёвай распрацоўкай паводзін і знешняга аблічча персанажа, дакладнасцю сац. характарыстык вобразаў. Сярод лепшых роляў: Шмігельскі, Праменны («Партызаны», «Мілы чалавек» К.Крапівы), Прыстаў («Бацькаўшчына» К.Чорнага), Лейтэнант («Канстанцін Заслонаў» А.Маўзона), Кругляш («Гута» Р.Кобеца), Дароднаў, Лыняеў, Мілаўзораў, Барабошаў («Позняе каханне», «Ваўкі і авечкі», «Без віны вінаватыя», «Праўда добра, а шчасце лепш» А.Астроўскага), Сімяонаў-Пішчык («Вішнёвы сад» А.Чэхава), Мантэкі («Рамэо і Джульета» У.Шэкспіра), Настаўнік філасофіі, Жак («Мешчанін у дваранах», «Скупы» Мальера), фон Кальб («Каварства і каханне» Ф.Шылера), Пера Каленіч («Пані міністэрша» Б.Нушыча), Вернер («Рускія людзі» К.Сіманава), Рэдзька («У стэпах Украіны» А.Карнейчука) і інш. *Б.І.Бур'ян.*

ШАПО́ Уладзімір Дзмітрыевіч (н. 4.2.1949, г.п. Відзы Браслаўскага р-на Віцебскай вобл.), бел. акварэліст, графік. Скончыў маст.-графічны ф-т Віцебскага пед. ін-та (1972). Творы вылучаюцца эмацыянальнасцю, асацыятыўнасцю вобразных канструкцый, манументальнасцю кампазіцыйнай пабудовы, экспрэсіўнасцю і падкрэсленай дэкаратыўнасцю: серыі «Запаляр'е» (1979—84), «Паазер'е» (1980), «Казкі старога Браслава» (1984), «Храмы» (1993), «Рака часу» (1998), кампазіцыі «Піліп» (1980), «Возера Снуды. Гай» (1995). Аўтар афармленчых работ. *М.Л.Цыбульскі.*



У.Шапо. Мячэць. Серыя «Храмы». 1993.

ШАПО́РЫН Юрый Аляксандравіч (8.11.1887, г. Глухаў Сумскай вобл., Украіна — 9.12.1966), расійскі кампазітар, педагог. Нар. арт. СССР (1954). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1913) і Петраградскую кансерваторыю (1918). У 1919—34 узначальваў муз. частку драм. т-раў у Ленінградзе, з 1939 праф. Маскоўскай кансерваторыі. Працягваў гераіка-патрыят. традыцыі рус. класічнай музыкі. Сярод твораў: опера «Дзекабрысты» (паст. 1953), сімфонія-кантата «На полі Куліковым» (1939), араторыі «Паданне пра бітву за рускую зямлю» (1944), «Дакуль каршуну кружыць» (1963), сімфонія для хору і арк. (1932), рамансы на вершы рус. паэтаў. Сярод вучняў *Я.Святланаў*, *А.Флярковскі*, *Р.Шчадрын* і інш. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1946, 1952. Дзярж. прэмія Расіі 1966.

Тв.: Литературное наследие: статьи, письма... М., 1989.

Літ.: Мартынов И.И. Юрий Шапорин. М., 1966.

ШАПС Аляксандр Лявонцьевіч (26.5.1911 — 11.4.1965), расійскі рэжысёр. Засл. арт. Беларусі (1944). Засл. дз. маст. Расіі (1962). Скончыў Цэнтр. тэхнікум тэатр. мастацтва ў Маскве (1930). Працаваў акцёрам у т-рах Таганрога, Туапсэ. З 1931 рэжысёр Цэнтр. т-ра Чырв. Арміі, з 1941 Т-ра імя Массавета. У Вял. Айч. вайну ўдзельнічаў у арганізацыі і дзейнасці франтавой брыгады Дзярж. рус. драм. т-ра Беларусі. Паставіў у Т-ры імя Массавета п'есы «Хто смяецца апошнім» К.Крапівы (1954), «У ціхім завулку» А.Маўзона (1955). З інш. пастановак: «Світанне над Масквой» А.Сурава (1950), «Бітва ў дарозе» паводле Г.Нікалаевай (1959), «Сумленне» паводле Д.Паўлавай (1963, усе з Ю.Завадскім), «Васіль Цёркін» паводле А.Твардоўскага (1961). Дзярж. прэмія СССР 1950.

ШАПУ́Р I (?—272), правіцель *Сасанідаў дзяржавы* [239—272]. Сын *Ардашыра I*. Працягваў пачатае бацькам умацаванне і пашырэнне дзяржавы, усталяваў уладу *Сасанідаў* у Іране, далучыў да яе вял. вобласці на З і У ад Ірана. Вёў паспяховыя войны супраць Рым. імперыі, у 260 каля г. Эдэсы разбіў і ўзяў у палон рым. імператара Валерыяна і большую частку яго войска. Пры Ш. I у Іране праводзіліся ірыгацыйныя і буд. работы, заснавана шмат гарадоў; дзярж. рэлігіяй стаў *зараастрызм*.

ШАПУ́Р II (?—379), правіцель *Сасанідаў дзяржавы* [309—379]. Аб'яднаў дзяржаву, вярнуў шэраг раёнаў на зах. і ўсх. яе ўскраінах, страчаных яго папярэднікамі. Ваяваў з кушанскімі князтвамі (пазней падпарадкаваў іх), заключыў ваен. саюз з хіянітамі ў вайне (359—363) з Рымскай імперыяй і захапіў значныя яе тэрыторыі. Пры Ш. II пачалося ганенне на хрысціян (з 339/340, калі хрысціянства стала ператварацца ў дзярж. рэлігію ў Рыме). Засн. шэраг гарадоў.

ШАПЭ́Н (Chopin) Фрыдэрык (22.2 ці 1.3.1810, Жалязова-Воля, каля Варшавы — 17.10.1849), польскі кампазітар,

Ф.Шапэн.

піяніст; заснавальнік польскай муз. класікі. Вучыўся ў Гал. школе музыкі ў Варшаве пад кіраўніцтвам Ю.*Эльснера* (1826—29). Быў звязаны з удзельнікамі паўстання 1830—31. З 1831 у Парыжы. Яго творчасць рамант. па характары, глыбока нар., мае акрэсленую патрыят. накіраванасць, увасабляе абагульнены вобраз Польшчы (карціна яе гераічнага мінулага і сучаснага Ш. нар. побыту, матывы нац. л-ры, фальклору), раскрывае ідэі нац.-вызв. барацьбы. Пісаў пераважна фартэпіянную музыку, пашырыў маст. магчымасці інструмента, адыграў ролю ў развіцці фп. фактуры: меладызаваў муз. тканіну, узбагаціў яе спецыфічна фп. поліфаніяй, сінтэзаваў розныя віды тэхнікі, раскрыў выразнае значэнне дэмпфернай педалі. Яго наватарства выявілася ў галіне гармоніі, мелодыкі, рытмікі, у трактоўцы класічных жанраў і муз. форм. Стварыў жанр фп. балады, паглыбіў змест жанраў накцюрна, эцюда, прэлюдыі, скерца, узняў на высокі маст. ўзровень нац.-танц. жанры: мазурку, паланэз; надаў рысы рамант. паэмы фантазіі, санаце, баладзе, скерца. Сярод асн. твораў: 2 канцэрты для фп. з аркестрам (1829, 1830), 3 санаты (1827—28, 1839, 1844), фантазія (1841), 4 балады (1835—42), 4 скерца (1832—42), 4 экспромты (1834—42), 16 паланэзаў, 58 мазурак, 17 вальсаў, 21 накцюрн, 26 прэлюдый (у т.л. цыкл з 24 прэлюдый, 1839), 27 эцюдаў, п'есы для фп., фп. трыо (1829), саната для віяланчэлі і фп. (1846), 19 песень, баркарола, калыханка і інш. З 1927 у Варшаве праводзіцца міжнар. конкурс піяністаў імя Ш.

Тв.: Рус. пер. — Письма. Т. 1—2. 3 изд. М., 1982—84.

Літ.: Лист Ф. Ф.Шопен: Пер. с фр. 2 изд. М., 1956; Бэлза И.Ф. Шопен. М., 1968; Мазель Л.А. Исследования о Шопене. М., 1971; Николаев В. Шопен-педа-

гог. М., 1980; Szulc M.A. F.Chopin i utwory jego muzyczne... Kraków, 1986. *І.Дз.Назіна.*

ШАПЯЛЁВІЧ Васіль Васілевіч (н. 2.3.1945, в. Каўняцін Пінскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1994), праф. (1996). Скончыў Брэсцкі пед. ін-т (1969). З 1974 у Мазырскім пед. ін-це (у 1976—88 заг. кафедры, у 1992—98 прарэктар). Навук. працы па галаграфіі ў фотарэфрактыўных крышталях. Даследаваў уласцівасці галаграм у кубічных фотарэфрактыўных аптычна актыўных крышталях, якія праяўляюць п'езаэлектрычныя і фотапругкія ўласцівасці.

Тв.: Введение в когерентную оптику и голографию. Мн., 1985; Теория связанных волн для описания дифракции света на ультразвуке в оптически активной среде // Оптика и спектроскопия. 1987. Т. 62, вып. 6; Gain optimization with respest to the thickness of a sillenite crystal (у сааўт.) // Applied physics. B. 1999. Vol. 68, № 5.

ШАПЯЛЁВІЧ Васіль Рыгоравіч (н. 19.1.1947, в. Блужа Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1992), праф. (1994). Скончыў БДУ (1970), дзе і працуе. Навук. працы па фіз. матэрыялазнаўстве. Устанавіў заканамернасці ўплыву знешніх уздзеянняў (пластычнай дэфармацыі, тэрмічнай апрацоўкі) на структуру і электрафіз. ўласцівасці паўметалаў, заканамернасці ўплыву звышхуткай загартоўкі з вадкай фазы на структуру і фіз.-мех. ўласцівасці сплаваў. Распрацаваў комплекс пераўтваральнікаў на аснове эфекту Хола для аўтаматызацыі і рабатызацыі вытв. сістэм.

Тв.: Основы фотонных и электронных процессов в кристаллах. Гомель, 1999 (разам з В.І.Пракошыным, В.М.Драко); Сборник задач по физике металлов и металловедению. Мн., 2000.

ШАПЯЛЁВІЧ Канстанцін Іванавіч (2.9.1889, в. Брадок Мінскага р-на — 27.6.1976), бел. мовазнавец і педагог. Скончыў Барунскую настаўніцкую семінарыю (1909), Магілёўскі настаўніцкі ін-т (1916). Працаваў настаўнікам, з 1932 выкладчык бел. мовы ў Вышэйшай камуніст. с.-г. школе Беларусі, у 1934—41 Бел. політэхн. ін-та, у 1943—56 БДУ. Аўтар і сааўтар літ. чытанак і падручнікаў па бел. мове для пач. школы «Чырвоная Беларусь» (1925), «Рабочая кніга па беларускай мове» (1931), «Беларуская мова» (ч. 1—3, 1933), «Беларуская мова» (ч. 1—4, 1945—47). Удзельнічаў у зборы і падрыхтоўцы лексічнага матэрыялу для слоўніка бел. мовы.

І.К.Германовіч.

ШАПЯЛЁВІЧ Уладзімір Аляксандравіч (н. 28.8.1957, г. Пінск Брэсцкай вобл.), бел. мастак. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1983). Працуе ў станковых графіцы і жывапісе. Творы, выкананыя шырокай пастознай манерай пісьма, вылучаюцца гарманічным адзінствам каларыстычнага і кампазіцыйнага вырашэння, спалучэннем ураўнаважаных элементаў рэаліст. трактоўкі з дынаміч-на-пластычнымі абстрактнымі матывамі: «Першы снег» (1991), «Вераснёўскія дажджы» (1992), «Чырвоныя клёны» (1993), «Рачны вакзал» (1994), «Крылы восені» (1997), «Каханне», «Гарадскі раманс», «Правінцыя» (усе 1998). Іл. гл. таксама да арт. *Гуаш.*

ШАПЯЛЁВІЧЫ, вёска ў Круглянскім р-не Магілёўскай вобл., на р. Аслік. Цэнтр сельсавета і унітарнага камунальнага с.-г. прадпрыемства. За 28 км на ПдЗ ад г.п. Круглае, 60 км ад Магілёва, 25 км ад чыг. ст. Слаўнае. 401 ж., 155 двароў (2003). Лясніцтва, лесагасп. прадпрыемства «Цяцерына». Сярэдняя школа-сад, клуб, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

У ВКЛ вядомы з 16 ст. У *вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67* рас. армія на чале з кн. А.М.Трубяцкім у жн. 1654 каля Ш. разбіла войскі літ. гетмана Я.Радзівіла. З 1772 у Рас. імперыі. У 1779 пабудавана царква. З 1827 мястэчка ў Магілёўскім пав., 570 ж. У 1848 — 134 двары. У 1863 адкрыта царк.-прыходская школа. З 1867 быў маёнтак (1606 дзесяцін зямлі, бровар, вадзяны млын, карчма). У 1897 — 907 ж., 139 двароў, у Цяцерынскай вол. Магілёўскага пав., царк.-прыходская і яўр. малітоўная школы, хлебазапасны магазін, заезны дом, царква. З 20.8.1924 цэнтр сельсавета. У 1924—35 і ў 1959—66 у Бялыніцкім, у 1935—59 і з 1966 у Круглянскім р-нах. У 1926 — 1009 ж., 204 двары, у 1940 — 686 ж., 162 двары. У Вял. Айч. вайну 5.12.1942 партызаны 8-й Круглянскай брыгады разграмілі ў Ш. ням. гарнізон. У 1944 ням. фашысты спалілі вёску, загубілі 163 жыхары. *А.Г.Шчарбатаў.*

ШАР, геаметрычнае цела, абмежаванае звонку *сферай*. Атрымліваецца пры вярчэнні *круга* вакол восі, што праходзіць праз яго дыяметр. Адлегласць R ад цэнтра Ш. да любога пункта яго паверхні аднолькавая і наз. *радыусам* Ш. Аб'ём Ш. $V=4/3\pi R^3$, плошча яго паверхні $S=4\pi R^2$.

У.**Шапялевіч**. Рачны вакзал. 1994.

ШАРАВА́РАЎ Георгій Аляксандравіч (н. 10.3.1931, Кіеў), бел. вучоны ў галіне ядз. энергетыкі. Д-р тэхн. н. (1983), праф. (1984). Скончыў Кіеўскі політэхн. ін-т (1956). З 1967 заг. аддзялення Ін-та ядз. энергетыкі АН Беларусі. З 1992 дырэктар, з 2001 заг. лабараторыі Ін-та радыеэкалагічных праблем Нац. АН Беларусі. Навук. працы па праблемах бяспекі ядз. тэхналогій, радыеэкалогіі і кіравання надзвычайнымі сітуацыямі. Пад яго кіраўніцтвам распрацавана тэхналогія пераўтварэння разбуранага рэактара Чарнобыльскай АЭС і забруджаных радыенуклідамі тэрыторый у экалагічна бяспечную сістэму (2000).

Тв.: Динамика АЭС с диссоциирующим теплоносителем. Мн., 1980; Физика нестационарных процессов АЭС. Мн., 1985.

А.І.Болсун.

ШАРАВА́РАЎ Канстанцін Рыгоравіч (н. 15.8.1964, Мінск), бел. спартсмен (гандбол). Засл. майстар спорту СССР (1988). Скончыў Бел. ін-т фіз. культуры (1985). Чэмпіён XXIV Алімп. гульняў (1988, Сеул). Чэмпіён свету сярод юніёраў (1983, 1985), сярэбраны прызёр чэмпіянату свету (1990). Чэмпіён СССР (1984, 1985, 1986, 1988, 1989), сярэбраны (1982, 1983, 1987, 1990) і бронз. (1991) прызёр. За зборную каманду СССР згуляў (1986—91) 93 матчы, закінуў 223 мячы. Уладальнік Кубка еўрап. чэмпіёнаў (1987, 1988, 1989), Кубка кубкаў (1988), Суперкубка (1989). Гуляў у складзе каманды СКА (Мінск, 1982—92), замежных (Германія, Ізраіль, Швецыя) клубаў (з 1992). Сярэбраны прызёр чэмпіянату Ізраіля (1994).

А.М.Петрыкаў.

ШАРАВА́Я МАЛА́НКА, гл. ў арт. *Маланка.*

«ШАРАВА́Я МАЛА́НКА» («Kugelblitz»), кодавая назва карнай аперацыі ням. фашыстаў супраць партызан і мясц. насельніцтва Суражскай партыз. зоны 14.2 — 19.3.1943 у Вял. Айч. вайну. Праводзілася сіламі 201-й ахоўнай дывізіі, 2-га матарыз. палка 3-й танк. арміі, 3 мясц. паліцэйскіх фарміраванняў, артыл., сапёрных, контрразведвальных падраздзяленняў 825-га «ост-мусульманскага» батальёна (усяго 36 тыс. салдат і афіцэраў) з падтрымкай бронецягніка і 10 бронемашын. Мэта аперацыі — акружыць і знішчыць партызан у трохвугольніку Гарадок—Сураж—Мяжа, захапіць працаздольнае насельніцтва для вывазу ў Германію, забяспечыць бяспеку руху па чыгункі на ўчастку Віцебск—Гарадок—Невель, перашкодзіць баявому ўзаемадзеянню партызан з часцямі Чырв. Арміі. Да 14 лютага партызаны вялі бой, каб перашкодзіць праціўніку сканцэнтраваць сілы і захапіць плацдарм па берагах рэк вакол партыз. зоны. Гітлераўцы не здолелі ўварвацца ў партыз. зону і з 18 лют. пачалі сістэматычны абстрэл і бамбардзіроўку пярэдняга краю партыз. абароны. 11, 15, 20—24 лют. сав. самалёты ў дапамогу партызанам даставілі ў зону боепрыпасы і зброю, у т.л. 700 кг толу. У ноч на 23 лют. на бок партызан амаль у поўным

складзе перайшоў «ост-мусульманскі» батальён. Партызаны пазбягалі зацяжных баёў, прабіваючыся невял. групамі праз шчыльныя ланцугі карнікаў. Да 20 сак. гітлераўцы адышлі ў Віцебск, Гарадок, Сураж. Фашысты «праверылі» 169 вёсак, «прафільтравалі» 3583 чал. і перадалі іх 9-й эйнзацкамандзе СД, 1456 чал. з іх расстралялі, 804 чал. даставілі на зборны лагер для адпраўкі на прымусовыя работы. У палон узята 260 партызан, з якімі па-зверску расправіліся — жанчын і дзяцей знішчалі гранатамі, злоўленых у лесе жыхароў жывымі спальвалі ва ўцалелых пабудовах. У баях гітлераўцы страцілі каля 500 забітымі і параненымі, амаль поўнасцю знішчаны бронедывізіён вермахта. Працягам «Ш.м.» стала карная аперацыя *«Грамавы ўдар»*.

У.С.Пасэ.

ШАРАВЫ́Я ФУ́НКЦЫІ, тое, што *сферычныя функцыі*.

ШАРА́ДА (франц. charade літар. — балбатня, гаворка), від літаратурнай, звычайна вершаванай, гульні-загадкі, у якой зашыфраванае слова адгадваецца па апісанні яго асобных складоў, літар ці частак гэтага слова з самаст. значэннем [напр., я — майка і Ямайка (востраў)].

У фальклоры амаль невядома. У пісьмовай л-ры Ш. былі папулярныя ў салоннай культуры 17—18 ст. Пашырана ў дзіцячай л-ры.

В.П.Рагойша.

Шаралезская парода.

ШАРАЛЕ́ЗСКАЯ ПАРО́ДА, шаралe, парода буйной рагатай жывёлы мясного кірунку. Выведзена як малочна-мясная і рабочая жывёла ў 18 ст. ў Францыі, у р-не Шаралe (Charolais) паляпшэннем мясц. горнай жывёлы; у 19 ст. скрыжоўвалі з *шартгорнскай пародай*. Пашырана паўсюдна. На Беларусі асн. яе племянная гаспадарка «Дружба» Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл.

Жывёлы буйныя. Касцяк масіўны. Тулава доўгае, яго пярэдняя і задняя ч. развіты прапарцыянальна. Галава невялікая, каротkая і шырокая з доўгімі закругленымі рагамі. Шэрсць доўгая, тонкая, хвалістая. Масць крэмава-белая, насавое «люстэрка» ружовае, рогі і капыты васковага колеру. Маса быкоў 1000—1200, кароў — 700—800 кг. Забойны выхад 60—70%. Скараспелыя. Непатрабавальныя да ўмоў утрымання, добра акліматызуюцца.

ШАРАМЕ́ТА Мікалай Васілевіч (н. 12.8.1924, в. Лазовіца Камянецкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. мовазнавец. Д-р філал. н. (1989). Скончыў Львоўскі ун-т (1953). Настаўнічаў. З 1961 працаваў у Бельцкім пед. ін-це (Малдова). З 1967 выкладае у Мінскім лінгвістычным ун-це (з 1991 праф.). Даследуе дынамічныя з'явы ў моўнай сістэме і ў маўленні. Аўтар манаграфій «Міжузроўневыя структуры дзеяслоўнага класа: На матэрыяле французскай мовы» (1988), «Міжузроўневыя дзеяслоўныя ўтварэнні ў сучаснай французскай мове» (1990), вучэбных дапаможнікаў «Параўнальная тыпалогія французскай, рускай і беларускай моў» (1982, з В.Паўлоўскім), «Сістэма дзеяслоўных аналітызмаў у сучаснай французскай мове» (1985) і інш.

ШАРАМЕ́ЦЕВЫ, баярскі, з 1706 графскі род у Расіі 15 — пач. 20 ст., прадстаўнікі якога займалі буйныя ваен. і дзярж. пасады, былі вядомымі мецэнатамі і дабрачынцамі. З малодшай лініі роду маскоўскага баярына 14 ст. Андрэя Кабылы (выхадзец з ВКЛ, продак *Раманавых* і інш. баярскіх фамілій). Заснавальнік роду Андрэй Канстанцінавіч Шарамет, пяцёра ўнукаў якога ў сярэдзіне 16 ст. атрымалі баярства. Найбуйнейшыя землеўладальнікі (у 1861 мелі 800 тыс. дзесяцін зямлі, 300 тыс. прыгонных сялян). З іх найб. вядомы: Іван Васілевіч Вялікі (?—1577), баярын (з 1550), ваявода, чл. *Выбранай рады*, у гады *апрычніны* ўплывовы чл. Земскай баярскай думы. Фёдар Іванавіч Ш. (?—1650), баярын, ваявода, фактычны кіраўнік рас. ўрада ў 1642—45. Васіль Пятровіч Ш. (?—?), баярын, ваявода, у *вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67* камандаваў рас. арміяй на тэр. Беларусі, якая ў 1654 заняла Полацк, Віцебск, Дзісну, Друю. Барыс Пятровіч Ш. (1652—1719), гл. *Шарамецеў* Б.П. Пётр Барысавіч Ш. (1713—88), сын Барыса Пятровіча, граф, ген.-аншэф (1760), обер-камергер (1761). Уладальнік сядзіб Кускова і *Астанкіна*. Стварыў балетную і жывапісную школы, прыгонны тэатр, сабраў найкаштоўнейшыя калекцыі прадметаў мастацтва. Мікалай Пятровіч Ш. (1751—1809), сын Пятра Барысавіча, граф, обер-камергер (1798). Пасля смерці жонкі, б. прыгоннай П.І.*Жамчуговай* засн. у Маскве багадзельню.

ШАРАМЕ́ЦЕЎ Барыс Пятровіч (5.5.1652, Масква — 28.2.1719), расійскі военачальнік, дыпламат. Баярын (1682), граф (1706), ген.-фельдмаршал (1701). З роду *Шарамецевых*. Удзельнік заключэння *«Вечнага міру» 1686*, дыпламат. місій 1686—87 у Рэч Паспалітую і Аўстрыю для заключэння ваен. саюза супраць Турцыі. У рус.-тур. вайну 1686—1700 камандаваў войскамі Белгародскай абарончай лініі (1687—94) і рус. арміяй на Украіне (1695—96), удзельнічаў у паходах на Крым (1687, 1689), выконваў дыпламат. даручэнні цара ў Рэчы Паспалітай, Аўстрыі, Італіі і на в-ве Мальта (1697—99). Удзельнік *Паўночнай вайны 1700—21* і рус.-тур. вайны 1710—13. Камандаваў: дваранскай конніцай у няўдалай бітве пад Нарвай (1700); рус. войскамі ў Прыбалтыцы (1701—05), дзе разбіў швед. войскі пад Эрэстферам і Гумельсгофам (1702), узяў Нотэбург (Шлісельбург, 1702) і інш. крэпасці; войскамі, якія падавілі *Астраханскае паўстанне 1705—06*; групоўкамі рус. войск на Беларусі (1707—08), якую наўмысна спусташаў, адыходзячы пад націскам шведаў; гал. сіламі рус. арміі на Украіне (1708—09, у т.л. ў *Палтаўскай бітве 1709*), у Прыбалтыцы, дзе ўзяў г. Рыга (1710), у *Пруцкім паходзе 1711*; «назіральнай» арміяй на Украіне (1712—13); рус. войскамі ў Памеранії і Мекленбургу (1715—17). Паказаў сябе здольным, але вельмі асцярожным і часам марудлівым палкаводцам.

М.Г.Нікіцін.

ШАРАНГО́ВІЧ Васіль Пятровіч (н. 14.1.1939, в. Качаны Мядзельскага р-на Мінскай вобл.), бел. графік, педагог. Брат К.П.*Шаранговіча*. Засл. дз. маст. Беларусі (1978). Засл. дз. культ. Польшчы (1986). Нар. мастак Беларусі (1991). Праф. (1981). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1966). У 1967—98 выкладаў у Бел. АМ (у 1972—89 заг. кафедры, у 1986—89 прарэктар, у 1989—97 рэктар). З 1997 дырэктар Музея сучас-

В.**Шаранговіч**. Паляванне. Ілюстрацыя да паэмы «Пан Тадэвуш» А.Міцкевіча. 1985.

нага выяўл. мастацтва. Працуе ў галіне кніжнай і станковай графікі. Творчасці ўласцівы разнастайнасць графічных тэхнік і стылявых прыёмаў, выразны малюнак, эмацыянальнасць і глыбокая змястоўнасць вобразаў. Работы ў кніжнай графіцы адметныя тонкім разуменнем структуры і ладу літ. твора, паглыбленай пранікнёнасцю ў псіхалогію персанажа, вострым пачуццём гармоніі элементаў афармлення кнігі: «Віленскія камунары» М.Гарэцкага (1965), «З майго летапісу» Я.Коласа, «Дзесяць дзён, якія скаланулі свет» Дж. Рыда (абедзве 1967), «Мая Беларусь» Т.Хадкевіча, «Збор твораў» М.Багдановіча (т. 1—2, усе 1968), «Зямля навагрудская, краю мой родны...» А.Міцкевіча, «Салавей» З.Бядулі (абедзве 1969), «У.І.Ленін» У.Маякоўскага (1970), «Залаты ключык, або Прыгоды Бураціна» А.Талстога (1971), «Вершы» Я.Коласа (1972), «Сорак трэці» І.Навуменкі (1974), «Паэмы» (1978) і «Адвечная песня» (1981) Я.Купалы, «Споведзь сэрца» А.Бялевіча (1978), «Пан Тадэвуш» Міцкевіча (1985, 1998), «Старыя беларускія хронікі» У.Караткевіча (1988), «Новая зямля» Я.Коласа (2002). Рэквіем людской мужнасці і стойкасці ў гады Вял. Айч. вайны, увасоблены строгімі сродкамі графікі, гучыць у цыкле моцных па экспрэсіі гравюр «Памяці вогненных вёсак» (1979—85, Дзярж. прэмія Беларусі 1986). У станковых работах шырока выкарыстоўвае нац. маст. традыцыі, сімволіку і метафару, у многіх творах адчувальна паэтызацыя чалавечага быцця з яго прыгажосцю і драматызмам, калізіямі, што дасягаецца своеасаблівасцю ракурсаў каларыту, рытмічнай арганізацыі прасторы: «Смерць Гражыны» (паводле Міцкевіча, 1970), «Партрэт Ф.Скарыны» (1971), «Ганчар» (1973), «А хто там ідзе» (1976), серыі «Край нарачанскі» (1972—75), «Блакада. 1943 год» (1974), трыпціх «Дзе крыўда адвечная спела» (1982) і інш.

В.П.Шаранговіч.

В.Ф.Шаранговіч.

Літ.: Ганчароў М.І. Васіль Шаранговіч. Мн., 1981. *Н.В.Шаранговіч.*

ШАРАНГО́ВІЧ Васіль Фаміч (4.3.1897, в. Качаны Мядзельскага р-на Мінскай вобл. — 15.3.1938), дзяржаўны і парт. дзеяч БССР, удзельнік устанаўлення сав. ўлады на Беларусі, грамадз. вайны і ваен. інтэрвенцыі 1918—20. З 1918 у Чырв. Арміі. У 1919—20 на падп. рабоце ў Мінскай губ., быў арыштаваны польск. ўладамі. У 1921—26 нам. наркома юстыцыі, пракурор БССР, заг. арганізац. аддзела і адказны сакратар Цэнтр. Савета прафсаюзаў Беларусі. З 1926 на прафс. рабоце ў Сібіры, 1-ы сакратар Іркуцкага акр. к-та ВКП(б). З кастр. 1930 да лют. 1934 2-і сакратар і чл. Бюро ЦК КП(б)Б. З 1934 чл. Камісіі парт. кантролю пры ЦК ВКП(б), упаўнаважаны КПК па Казахстане, з 1936 — па Харкаўскай вобл. З сак. да ліп. 1937 1-ы сакратар і чл. Бюро ЦК КП(б)Б. Чл. ЦК КП(б)Б у 1925—27, 1932—34, 1937. Чл. ЦВК БССР у 1925—26, 1931—34 і яго Прэзідыума ў 1931—34. Зняты з пасады 1-га сакратара паводле пастановы Палітбюро ЦК ВКП(б) «Па пытанні аб кіраўніцтве КП(б)Б» ад 27.7.1937 і ў той жа дзень арыштаваны ў Маскве. Неабгрунтавана абвінавачаны ў варожай дзейнасці супраць сав. улады. 13.3.1938 ваен. калегіяй Вярх. суда СССР прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны ў Маскве. Рэабілітаваны ў 1957.

Літ.: Адамушка У.І. Дзесяты першы сакратар // Памяць. Гіст.-дак. хроніка Мядзельскага р-на. Мн., 1998. *Р.П.Платонаў.*

ШАРАНГО́ВІЧ Канстанцін Пятровіч (н. 4.1.1956, в. Качаны Мядзельскага р-на Мінскай вобл.), бел. мастак. Брат В.П.*Шаранговіча*. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1980). З 1985 выкладае ў Бел. АМ (з 2000 заг. кафедры). Адзін з заснавальнікаў і кіраўнік салона-галерэі «ГАЛ-творчасць» (з 1989). Працуе ў кніжнай і станковай графіцы, жывапісе. Афарміў «Казкі беларускіх пісьменнікаў» (1983), «Азербайджанскія народныя казкі» (1992), кнігі «Слон купіў веласіпед» І.Бурсава (1984), «Казкі. Нарысы. Літаратурныя партрэты» К.Паустоўскага, «Дзецям» В.Віткі (кн. 1—2), «Вайна з саламандрамі; Апавяданні» К.Чапека, «Мсціжы» І.Пташнікава (усе 1986), «Балады вайны і міру» А.Лойкі (1988), «У гадзіну Стральца» К.Тарасава (1989), «Люблю, спадзяюся, жыву» Г.Пашкова, «Аватара» В.Суханава (абедзве 1990), «Злая зорка» І.Шамякіна (1993), «ТВТ» Я.Маўра (1997). Аўтар графічнай серыі паводле рамана «Подых навальніцы» І.Мележа. (1980), жывапісных кампазіцый «Гара Чантурыя» (1989), «Рыжы лес» (1990), «Блакітная мячэць» (1992), «Вячэрні матыў» (1995), «Нёман» (2001), «Старая яблыня» (2002) і інш. Творы вылучаюцца вобразнасцю сюжэта, эмацыянальнасцю, лаканічнасцю выразных сродкаў. *Л.Ф.Салавей.*

ШАРА́ПА Аляксандр Віктаравіч (н. 26.1.1938, в. Ходараўцы Лідскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (1988), праф. (1989). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1960), ВПШ пры ЦК Сацыялісц. адзінай партыі Германіі ў Берліне (1978). З 1982 у БДУ (прарэктар па міжнар. сувязях, з 1992 заг. кафедры, з 1995 дэкан ф-та міжнар. адносін). Даследуе праблемы міжнар. палітыкі Рэспублікі Беларусь. Аўтар прац «Мерыдыяны дружбы» (з І.І.Сачанкам), «Па краю бездані» (з В.М.Свістуном; абедзве 1992), «Бяспека: падыходы Захаду» (1994, з А.А.Разанавым) і інш.

Тв.: Die Hauptrichtungen der Unabhändigen Staaten. Wien, 1997; Europäische Sicherheit: Einige Aspecte der Position von Belarus // Österreichische Militärische Zeitschrift. 1997. № 2. *П.М.Бараноўскі.*

ШАРАПАДО́БНЫХ А́МФАР КУЛЬТУ́РА, археалагічная культура познанеалітычных плямён, якія ў 3-м тыс. да н.э. жылі на тэр. цэнтр. і ўсх. Германіі, Польшчы, Чэхіі, на ПнУ Румыніі, у лесастэпавай частцы Правабярэжнай Украіны, на З Беларусі. Падзялялася на групы і варыянты. Насельніцтва займалася сельскай гаспадаркай і паляваннем. Паселішчы размяшчаліся на берагах рэк. Жытлы пераважна наземныя, слупавой канструкцыі, часам шматкамерныя з каменнымі або глінянымі агнішчамі; месцамі сустракаюцца паўзямлянкі. Побач з жытламі ствараліся гасп. ямы. Пахавальны абрад — трупапалажэнне ў неглыбокіх ямах, абкладзеных каменнымі плітамі або валунамі, часам няпоўнае трупаспаленне. Пахавальны інвентар прадстаўлены каменнымі і касцянымі прыладамі працы, керамікай, упрыгожаннямі. Месцамі над пахаваннямі насыпалі курганы. Былі пахаванні індывід. і групавыя, часам у іх знаходзяць рэшткі жывёл. Сустракаюц-

Да арт. **Шарападобных амфар культура.** Пасудзіна з могільніка Малыя Ёдкавічы Бераставіцкага раёна Гродзенскай вобл.

ца і асобныя рытуальныя пахаванні жывёл. Для керамікі характэрны амфары з шарападобным корпусам (адсюль назва культуры) і верт. венчыкам, разнастайныя гаршкі, кубкі, міскі, арнаментаваныя пераважна ў верхняй частцы адбіткамі лінейнага штампа, шнура, насечкамі, наколкамі. Сярод прылад працы і

зброі — крамянёвыя сякеры-кліны і долаты, касцяныя нажы і долаты, верацёнападобныя наканечнікі стрэл. Для ўпрыгожанняў характэрны бурштынавыя вырабы, аздобы з косці і гліны. На тэр. Беларусі носьбіты гэтай культуры праніклі на познім этапе яе развіцця. Найб. вядомыя помнікі — могільнікі Краснасельскі і Малыя Ёдкавічы (Ваўкавыскі і Бераставіцкі р-ны Гродзенскай вобл.).

Літ.: Свешников И.К. Культура шаровидных амфор. М., 1983; Чарняўскі М.М. Культура шарападобных амфар // Археалогія Беларусі. Мн., 1997. Т. 1.

М.М.Чарняўскі.

ША́РАЎ Канстанцін Канстанцінавіч (н. 18.1.1954, Мінск), бел. арганіст і клавесініст. Скончыў Бел. (1977) і Латв. (1981) кансерваторыі. З 1981 саліст Бел. філармоніі, адначасова ў 1984—99 удзельнік ансамбля «*Кантабіле*». У рэпертуары тэматычныя праграмы стылістычнай накіраванасці, манаграфічныя цыклавыя канцэрты, невядомыя раней творы бел. музыкі і інш. Вядзе канцэртную дзейнасць, філарманічныя тэматычныя сустрэчы. *І.Л.Чэбан.*

ШАРАХО́ЎСКІ Янка (Іван Захаравіч; 4.3.1908, г.п. Бялынічы Магілёўскай вобл. — 6.4.1973), бел. пісьменнік і літаратуразнавец. Скончыў Ленінградскі гісторыка-лінгвістычны ін-т (1931). Працаваў у рэдакцыях часопісаў, з 1948 гал. рэдактар Дзярж. выд-ва БССР, з 1957 нам. міністра культуры Беларусі, з 1959 гал. рэдактар газ. «Літаратура і мастацтва», у 1961—68 дырэктар Літ. музея Я.Купалы. Творчую дзейнасць пачаў як паэт з 1927, як літ. крытык з 1931. Даследаваў жыццё і творчасць В.Дуніна-Марцінкевіча, Ф.Багушэвіча, Я.Купалы, П.Пестрака, В.Таўлая і інш. Аўтар зб. апавяданняў «Срэбраная раніца» (1951), кн. для дзяцей «Сардалікавая бухта» (1955). На бел. мову пераклаў раманы І.Тургенева «Рудзін» і «Напярэдадні», аповесць У.Караленкі «Сляпы музыкант», а таксама некат. творы М.Бубяннова, Ф.Гладкова, А.Первенцава, М.Салтыкова-Шчадрына, І.Франко, М.Шолахава.

Тв.: Пясняр народных дум: (Нарыс жыцця і дзейнасці Я.Купалы): Дарэвалюцыйны перыяд. Мн., 1970; Пясняр народных дум: Нарыс жыцця і дзейнасці Я.Купалы: Савецкі перыяд. Мн., 1976; Сплочаны доўг. Мн., 1978.

ШАРАШО́ВА, гарадскі пасёлак у Пружанскім р-не Брэсцкай вобл., на р. Левая Лясная (бас. р. Зах. Буг). За 20 км на З ад г. Пружаны, 32 км ад чыг. ст. Аранчыцы на лініі Брэст—Баранавічы, 97 км ад Брэста. 2,2 тыс. ж. (2002). Прадпрыемствы дрэваапр., харч. прам-сці. Сярэдняя і муз. школы, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца, паліклініка, аптэка, аддз. сувязі. Брацкія магілы: сав. воінаў і партызан, партызан і ахвяр фашызму. Помнікі архітэктуры: званіца (1799), *Шарашоўская Петрапаўлаўская царква*, Свята-Мікалаеўская царква (1872), касцёл Прасвятой Тройцы (1830—40-я г.).

У пісьмовых крыніцах вядома з 1380 як вёска. У пач. 16 ст. ўладанне берасцейскага старосты Ю.Іллініча. У 1536 Ш. купіла каралева Бона і дала яму гар. правы (пазбаўлена ў 1776). Было ў складзе Камянецкага, з 1566 Берасцейскага пав. Цэнтр нягродавага староства. У 16 ст. тут створана *Шарашоўскае евангелле*. З 1795 у складзе Рас. імперыі, мястэчка, цэнтр воласці Пружанскага пав. Гродзенскай губ. У 1824 пабудавана Петрапаўлаўская царква. З 1921 у складзе Польшчы, горад, цэнтр гміны Пружанскага пав. Палескага ваяв. З вер. 1939 у складзе БССР, з 15.1.1940 гар. пасёлак, цэнтр *Шарашоўскага раёна* Брэсцкай вобл. У Вял. Айч. вайну з 23.6.1941 да 17.7.1944 акупіравана ням. фашыстамі, якія загубілі ў Ш. і раёне 1992 чал. З 17.12.1956 у Пружанскім р-не.

Шарашоўскае евангелле. Мініяцюра «Іаан».

ШАРАШО́ЎСКАЕ ЕВА́НГЕЛЛЕ, бел. рукапісны помнік 16 ст. У 16—17 і 19 ст. было напрастольным у царкве г.п. Шарашова Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. Тэкст напісаны чорным чарнілам, загалоўкі — кінавар'ю. Маст. аздабленне складаецца з 4 мініяцюр з выявамі евангелістаў, выкананых чырв., карычневай і залаціста-зялёнай фарбамі, 5 застаўак, малюнкаў на палях (расл. арнаментыка) і ініцыялаў. Зберагаецца ў Нац. маст. музеі Беларусі.

Літ.: Жывапіс Беларусі XII—XVIII стст. Мн., 1980. С. 23—25. *В.Ф.Шматаў.*

Шарашоўская Петрапаўлаўская царква.

ШАРАШО́ЎСКАЯ ПЕТРАПА́ЎЛАЎСКАЯ ЦАРКВА́, помнік драўлянага дойлідства 19 ст. ў г.п. Шарашова Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. Пабудавана ў 1824. Мае рысы класіцызму. Адназрубная пабудова з 3-граннай алтарнай апсідай накрыта высокім 2-схільным дахам з вальмамі над алтаром. Гал. фасад мае 6-калонны порцік з трохвугольным франтонам, увянчаным 2-яруснай фігурнай вежачкай. Сцены ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі. У аздобе гал. фасада выкарыстаны паліхромная афарбоўка, дэкар. шалёўка франтона ў елачку, размалёўка на рэліг. сюжэты. Аконныя праёмы прамавугольныя і рамбічныя. *У.В.Алісейчык.*

ШАРАШО́ЎСКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1940—56. Утвораны 15.1.1940 у Брэсцкай вобл. Цэнтр — г.п. *Шарашова*. 12.10.1940 падзелены на 10 сельсаветаў. 17.12.1956 раён скасаваны, яго тэр. ўключана ў Пружанскі р-н.

ШАРВА́РКІ, натуральныя павіннасці па будаўніцтве і рамонце замкаў, дарог, мастоў, грэбляў, плацін, млыноў і інш. дзярж. і панскіх збудаванняў, ачыстцы берагавых палос суднаходных рэк у ВКЛ, Рэчы Паспалітай і Рас. імперыі ў 15 — 1-й трэці 20 ст. Ш. не ўваходзілі ў склад *паншчыны*, іх памер не быў аднолькавы ў розных мясцовасцях; у 1-й пал. 19 ст. на Беларусі складаў да 24 і болей рабочых дзён у год з сял. двара. Найб. пашыранай інвентарнай нормай было 12 рабочых дзён у год з двара. Пасля *сялянскай рэформы 1861* цяжар Ш. значна павялічыўся з прычыны таго, што дарожныя ўчасткі часта замацоўвалі за сельскай грамадой за некалькі дзесяткаў вёрст ад паселішчаў, а сяляне абавязаны былі папраўляць дарогі пераважна ў час палявых работ. Дарожную павіннасць несла амаль выключна сялянства. Ш. ў 1921—39 існавалі ў Зах. Беларусі. *В.П.Панюціч.*

ШАРГЕ́Й Аляксандр Ігнацьевіч (псеўданім Кандрацюк Юрый Васілевіч; 21.6.1897, г. Палтава, Украіна — 1942 ?), украінскі і расійскі вынаходнік, адзін з заснавальнікаў *касманаўтыкі*. Вучыўся ў С.-Пецярбургскім політэхн. ін-це (з 1916). З 1918 працаваў у розных установах. У 1930—32 рэпрэсіраваны. У 1933—39 ва Укр. НДІ прамысл. энергетыкі. Займаўся праектаваннем і буд-вам элеватарнай тэхнікі, ветраэлектрастанцый і інш. У 1918—19 незалежна ад К.Э.*Цыялкоўскага* распрацаваў асн. праблемы касманаўтыкі: вывеў асн. ўраўненне руху ракеты, даў схему і апісанне

4-ступеньчатай ракеты на кіслародна-вадародным паліве і інш., прапанаваў выкарыстанне супраціўлення атмасферы для тармажэння спускальнага апарата, вывад на арбіту штучнага спадарожніка Месяца ці планеты з далейшай пасадкай на іх паверхню невял. вяртальнага пілатуемага апарата, выкарыстанне сонечнай энергіі ў космасе і інш. Вызначыў паслядоўнасць этапаў асваення касм. прасторы, будову міжпланетных касм. караблёў і інш. Многія ідэі і рашэнні Ш. выкарыстоўваюцца ў сучаснай касманаўтыцы. Яго імем названы кратэр на Месяцы.

Тв.: Завоевание межпланетных пространств. 2 изд. М., 1947; У кн.: Пионеры ракетной техники: Кибальчич, Циолковский, Цандер, Кондратюк: Избр. труды. М., 1964.

Літ.: Романенко Б.И. Ю.В.Кондратюк. М., 1988.

У.С.Ларыёнаў.

А.І.Шаргей.

ШАРДЭ́Н (Chardin) Жан Батыст Сімеон (2.11.1699, Парыж — 6.12.1779), французскі жывапісец. Вучыўся ў П.Ж.Каза, Н.Н.Куапеля і Ж.Б.Ванлао, у Парыжы. Раннім творам уласцівы дэкар. эфектнасць і сюжэтная займальнасць. Да 1730-х г. выпрацаваў уласную манеру, якая вылучаецца высакароднай стрыманасцю, яснасцю і прастатой. Яго жанравыя палотны прасякнуты тонкім лірызмам, сцвярджэннем годнасці людзей «трэцяга саслоўя»: «Разносчыца» (1739), «Ранішні туалет» (1741), «Малітва перад абедам» (1744). Партрэтам уласцівы жыццёвая непасрэднасць і задушэўнасць: «Хлопчык з ваўчком» (1738), «Партрэт жонкі» (1775). Як майстар нацюрморта, стваraў кампазіцыі са сціплым наборам прадметаў, якія вылучаюцца прадуманасцю пабудовы, матэрыяльнасцю і мяккасцю жывапіснай фактуры: «Люлькі і збан» (каля 1760—63), «Нацюрморт з атрыбутамі мастацтваў» (1766). Жывапісу Ш. ўласцівы адзінства серабрыста-шэрага і карычнявата тонаў, багацце рэфлексаў і ледзь улоўных адценняў, якія гарманізуюць пераходы ад святла да ценю.

Ж.Б.С.Шардэн. Ранішні туалет. 1741.

Літ.: Якимович А.К. Шарден и французское Просвещение. М., 1981.

ШАРЖ (ад франц. charge перабольшванне) у выяўленчым мастацтве, сатырычная ці дабрадушна-гумарыстычная выява (звычайна партрэт), у якой пры захаванні знешняга падабенства зменены і вылучаны найб. характэрныя рысы мадэлі; від *карыкатуры*. Лёгкасць і нязмушанасць кампазіцыі, парадыйнае выкарыстанне маст. прыёмаў, у т.л. гіпербалы і гратэску, даюць магчымасць гумарыстычна ці сатырычна паказаць пэўную асобу, падзеі міжнар. жыцця, быт. з'явы. У жанры Ш. працавалі А.Дам'е (Францыя), Дз.Маор (Расія); на Беларусі Я.Дамель, К.Бахматовіч, С.Богуш-Сестранцэвіч, Я.Бусел, М.Лісоўскі, А.Чуркін, В.Швяцоў, В.Шматаў і інш. Ш. найчасцей змяшчаюць у час. «Вожык». У літаратуры Ш. — паказ пэўнай з'явы ў зменены, скажоным выглядзе; вобраз, сатырычны або гумарыстычны твор, у якім наўмысна перабольшваюцца, вылучаюцца найб. характэрныя асаблівасці знешняга аблічча ці адмоўныя рысы ў характары чалавека. Асн. сродак адлюстравання ў памфлеце, фельетоне, эпіграме, пародыі. Трапныя гумарыстычныя Ш.-подпісы (часцей вершаваныя) дапаўняюць графічную ці жывапісную выяву, дапамагаюць дасягнуць большага камічнага эфекту. Ш. карысталіся Я.Купала, К.Чорны, К.Крапіва і інш. Трапныя подпісы да сяброўскіх Ш. пішуць Р.Барадулін, Г.Юрчанка і інш.

Публ.: Лісоўскі М., Барадулін Р. Няўрокам кажучы... Мн., 1971; Юрчанка Г. Парнаскія ўхабы. Мн., 1979; Абразы без абразы: Сяброўскія шаржы і эпіграмы. Мн., 1985.

В.Д.Сінякевіч (выяўл. мастацтва), *Л.М.Гарэлік.*

ШАР-ЗОНД, гумавы шар, напоўнены вадародам, з прымацаваным да яго *метэарографам*. Запускаецца ў атмасферу для вымярэння ціску, т-ры і вільготнасці паветра. На пэўнай вышыні шар лопаецца або аддзяляецца ад метэарографа, які на парашуце спускаецца на зямлю. Вышыня пад'ёму Ш.-з. да 40 км. Выкарыстоўваўся да вынаходства *радыёзонда*.

ША́РКАЎШЧЫНА, Шаркоўшчына, гарадскі пасёлак, цэнтр Шаркаўшчынскага р-на Віцебскай вобл., на р. Дзісна. За 197 км ад Віцебска. Чыг. ст. на лініі Крулеўшчына — Друя. Вузел аўтадарог на Браслаў, Міёры, Глыбокае, Дзісну. 7,6 тыс. ж. (2002). Прадпрыемствы харч. (кансервавы з-д), буд. матэрыялаў прам-сці. Школы: 2 сярэднія, спартыўная дзіцяча-юнацкая, дзіцячая мастацтваў; 2 б-кі, Дом культуры, Цэнтр рамёстваў, бальніца, паліклініка, 3 аптэкі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік вызвалення. Помнікі архітэктуры: цэрквы Усіх Смуткуючых Радасць (1897) і Свята-Успенская (1912), сядзібны дом (пач. 20 ст.).

Вядома з 1503 у ВКЛ як маёнтак Зяновічаў. Пазней належаў Сапегам, Дамброўскім, Лапацінскім. Побач узніклі мястэчкі Старая Ш. і Новая Ш. (з 1767), якія ў пач. 20 ст. зліліся з маёнткам. У 18 ст. ўзведзены мураваны палац, пабудавана царква. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у складзе Рас. імперыі, мястэчка Дзісенскага пав. Мінскай, з 1842 Віленскай губ. У 1863 адкрыта нар. вучылішча. У 1897 у Новай Ш. 1038 ж., 119 дамоў, 2 малітоўныя дамы, 23 крамы, аптэка, 2 карчмы, у Старой Ш. — 127 ж., 16 двароў, крама, карчма. З 1921 у складзе Польшчы, цэнтр гміны Дзісенскага пав. Віленскага ваяв. Пасля пабудовы чыг. Воранава—Друя чыг. станцыя. З 1939 у складзе БССР, 1802 ж. З 15.1.1940 цэнтр *Шаркаўшчынскага раёна* Вілейскай вобл., з 12.10.1940 гар. пасёлак. У Вял. Айч. вайну з 30.6.1941 па 1.7.1944 акупіраваны ням. фашыстамі, якія загубілі ў Ш. 865 жыхароў. З 20.1.1944 у Полацкай, з 8.1.1954 у Маладзечанскай, з 20.1.1960 у Віцебскай абл., у 1962—66 у Міёрскім р-не, з 30.7.1966 зноў цэнтр раёна.

Г.І.Дулеба (гісторыя).

ША́РКАЎШЧЫНСКАЯ ПАДПО́ЛЬНАЯ КАМСАМО́ЛЬСКА-МАЛАДЗЁЖНАЯ АРГАНІЗА́ЦЫЯ «ЗА РАДЗІ́МУ» ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала ў ліп. 1941 — ліп. 1944 на тэр. Шаркаўшчынскага р-на. Налічвала 31 чал. (кіраўнікі Г.К.Лысёнак, П.А.Балай, І.А.Гінько). З вясны 1943 дзейнасць арг-цыі накіроўвалі Вілейскія падп. абкомы КП(б)Б і ЛКСМБ. Падпольшчыкі вялі агітац. работу сярод насельніцтва, зрывалі мерапрыемствы акупац. улад, збіралі і перадавалі партызанам зброю, звесткі разведкі пра варожыя гарнізоны ў Варапаеве, Глыбокім, Паставах, Шаркаўшчыне, бланкі дакументаў, пісчую паперу. Летам 1943 напярэдадні адыходу ў партызаны падпольшчыкі падпалілі ў Варапаеве будынак біржы працы і знішчылі дакументы. Сумесна з партызанамі патрыёты знішчалі лініі сувязі, палілі масты на шашэйных дарогах і чыгункі, удзельнічалі ў нападах на гарнізоны акупантаў. У барацьбе супраць фаш. захопнікаў загінула 9 падпольшчыкаў.

М.Ф.Шумейка.

ША́РКАЎШЧЫНСКІ РАЁН. Размешчаны на З Віцебскай вобл. Утвораны 15.1.1940, скасаваны 17.4.1962, адноўлены 30.7.1966. Пл. 1,1 тыс. км². Нас. 22,2

тыс. чал. (2003), гарадскога 33,8%. Сярэдняя шчыльн. 20 чал. на 1 км^2. Цэнтр — г.п. *Шаркаўшчына*. Раён уключае 272 сельскія нас. пункты, 8 сельсаветаў: Більдзюжскі, Валожынскі, Германавіцкі, Ёдскі, Лужкоўскі, Радзюкоўскі, Ручайскі, Станіслававўскі.

Тэр. раёна ў межах *Дзісенскай нізіны*. Паверхня плоскаўвагнутая, значная ч. забалочаная, участкамі вылучаюцца марэнныя ўзгоркі; 80% яе ніжэй за 140 м, 20% на выш. 140—160 м. Найвыш. пункт 172 м (на Пн в. Гарбачэнкі). Карысныя выкапні: торф, гліны і суглінкі, пяскі і пясчана-жвіровы матэрыял. Сярэдняя т-ра студз. -7 °С, ліп. 17,8 °С. Ападкаў 564 мм за год. Вегетац. перыяд 185 сут. Найб. р. Дзісна з прытокамі Янка, Маціца, Бярэжа, Бярозаўка, Паловіца, Мнюта. Найб. азёры: Ілава, Карцэя і Княж. Глебы с.-г. угоддзяў пераважна дзярнова-падзолістыя і дзярнова-падзолістыя забалочаныя (93,9%). Пад лесам 23,7% плошчы. Пераважаюць хваёвыя, яловыя, бярозавыя, асінавыя і чорнаальховыя лясы; трапляюцца шэраальховыя, дубовыя, ясянёвыя і інш. Штучныя насаджэнні (каля 7%) пераважна хваёвыя. Найб. лясныя масівы на Пн і ПдЗ, вылучаюцца масівы Асвята, Ілава, Журавоўшчына. Пад балотамі 6,5% тэр. Найб. балотныя масівы Даўбенішкі, Лясное. На тэр. раёна заказнікі: рэсп. значэння — гідралагічны *Ельня* (частка), біял. *Забалацце* (частка); мясц. значэння — гідралагічны Стрэчна (частка). Помнікі прыроды мясц. значэння: паркі — «Ганова» ў в. Варонка, «Гарадзец» у в. Дзіўнае, «Юзафова» ў в. Юзафова, «Падоршчына» ў в. Падоршчына, геал. — гара Фядотава (в. Красная), града Зянкевіча (в. Парэчча), даліны — Быстрыцкая (в. Мельніца) і Местачковая (в. Лужкі); валуны — Вял. камень (в. Жукі-Ложныя, Лапунова) і Дубоўкаўскі (в. Дубоўка).

Агульная пл. с.-г. угоддзяў каля 71 тыс. га, з іх асушаных 36,6 тыс. га. На 1.1.2003 у раёне 18 калгасаў, 4 саўгасы, 35 фермерскіх гаспадарак. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, вырошчванні збожжавых і кармавых культур, лёну, бульбы. Прадпрыемствы прам-сці: харч. (мясныя, мяса-расл., агароднінныя кансервы, сокі, віно), буд. матэрыялаў (цэгла, сталярныя вырабы), каап. (хлебабулачныя, макаронныя, кандытарскія, абараначныя вырабы, швейная прадукцыя), каап.-нарыхтоўчай (мясныя і каўбасныя вырабы). Па тэр. раёна праходзяць: чыгунка Крулеўшчызна—Друя і аўтадарогі з Шаркаўшчыны на Браслаў, Міёры, Глыбокае, Дзісну. У раёне 9 сярэдніх, 15 базавых, 9 пач. школ, 11 дзіцячых садкоў, 24 клубы, 28 б-к, 3 бальніцы, паліклініка, амбулаторыя, 19 фельч.-ак. пунктаў. Музеі: імя Язэпа Драздовіча ў в. Германавічы і імя І.П.Сікоры ў в. Алашкі. Помнікі архітэктуры: царква (пач. 20 ст.) у в. Варонка; Благавешчанскі касцёл (1787), царква (пач. 20 ст.) і сядзіба (канец 18 ст.) у в. Германавічы; сядзіба (18—19 ст.) і капліца (канец 18 ст.) у в. Дзіўная; вадзяны млын (19 — пач. 20 ст.), Міхайлаўскі касцёл (1744—56, часткова перабудаваны ў 1843) і царква Раства Багародзіцы (1794) у в. Лужкі, Ілынская царква (пабудавана ў 1825 як касцёл, з 2-й пал. 19 ст. царква) у в. Шкунцікі. Выдаецца газ. «Кліч Радзімы».

М.А.Макаранка, Р.Р.Паўлавец.

М.П.**Шарко**.

Р.**Шарма**.

ШАРКО́ Мікалай Піліпавіч (2.1.1924, в. Макаўчыцы Дзяржынскага р-на Мінскай вобл. — 4.7.1997), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў Куйбышаўскае ваенна-пях. вучылішча (1943), Мінскі пед. ін-т (1954). У Вял. Айч. вайну з крас. 1943 на 3-м Укр., 1-м Бел. франтах. Удзельнік вызвалення Украіны, Беларусі. Рота на чале з капітанам Ш. вызначылася ў студз. 1945 у баях на тэр. Польшчы ў Вісла-Одэрскай аперацыі: у час прарыву варожай абароны захапіла 2 траншэі і 50 кулямётаў праціўніка; пры авалоданні нас. пунктамі Нова-Мяста і Глаўна знішчыла варожы дэсант (60 гітлераўцаў, 2 бронетранспарцёры, 4 аўтамашыны), разграміла варожую калону. Пасля вайны на адм. рабоце.

ШАРКО́ ДУШ, лячэбны душ; адзін з метадаў *водалячэння*. Прапанаваны франц. неўрапатолагам Ж.М.Шарко. Засн. на лекавым уплыве рухомага струменя вады пад моцным ціскам на розныя часткі цела.

Папераменна ўздзейнічаюць веерны (пачынаецца і заканчваецца працэдура) і кампактны струмені вады. Курс 10—12 працэдур. Фізіял. эфекты Ш.д. звязаны з мех. і тэмпературным уздзеяннем: спачатку звужаюцца перыферычныя сасуды, павышаецца артэрыяльны ціск, потым сасуды расшыраюцца. Ужываюць пры парушэннях абмену рэчываў (напр., атлушчэнне), маторыкі кішэчніка і інш.

І.М.Семяненя.

ША́РЛАТ (Charlotte), горад на ПдУ ЗША, штат Паўн. Караліна. Засн. ў 1768. 540 тыс. ж. (2000; з г. Гастонія, Рок-Хіл і агульнымі прыгарадамі больш за 1 млн. ж.). Трансп. вузел. Важны гандл.-фін. цэнтр. Буйны цэнтр тэкст. прам-сці. Прам-сць: машынабудаванне, у т.л. радыёэлектроннае, тэкст., прыладабудаванне, вытв-сць паравых турбін, прамысл. абсталявання; хім., харч., паліграф., папяровая. Ун-т.

«ШАРЛАТА́Н», бел. нар. танец. Муз. памер пераменны 3/4 і 2/4. Дзве асн. фігуры танца кантрастныя, выконваюцца паслядоўна ў павольным і хуткім тэмпе. Танцоры ў парах, злучыўшы накрыж рукі, рухаюцца па крузе, папераменна сыходзяцца да цэнтра і разыходзяцца, потым пары ныраюць адна адной пад паднятыя ўгору сплеценыя рукі («варотцы»). Існуе шмат варыянтаў мелодый і прыпевак да танца. Зафіксаваны ў 19 ст. ў Лідскім і Ваўкавыскім р-нах Гродзенскай вобл.

І.М.Хвораст.

ШАРЛЕРУА́ (Charleroi), горад на ПдЗ Бельгіі. 207 тыс. ж. (1994). Буйны трансп. вузел. Порт на р. Самбр. Прам-сць: чорная металургія, металаапрацоўка, цяжкае машынабудаванне, хім., шкляная, цэм., харчовая.

ШАРЛО́ТА-АМА́ЛІЯ (Charlotte Amalie), горад, гал. порт і адм. цэнтр Віргінскіх а-воў (уладанне ЗША) у Карыбскім м., на в-ве Сент-Томас. Засн. ў 1672. 12,3 тыс. ж. (1990). Важны порт для круізных суднаў. Турызм.

ШАРМ (франц. charme), чароўнасць, прывабнасць каго-н., якая амаль магічна ўздзейнічае на прысутных.

ША́РМА Ракеш (н. 13.1.1949, г. Патыяла, Індыя), першы індыйскі касманаўт. Герой Сав. Саюза (1984). Палкоўнік ВПС (1998). Скончыў Нац. акадэмію абароны (1970). З 1982 у Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю.А.Гагарына. 3—11.4.1984 з Ю.В.*Малышавым* і Г.М.*Стракалавым* здзейсніў палёт на касм. караблі «Саюз Т-11» (як касманаўт-даследчык) і на арбітальнай станцыі «Салют-7» (пасадка на касм. караблі «Саюз Т-10»). У космасе правёў 7,9 сут.

У.С.Ларыёнаў.

ША́РМАН (Charman) Хелен (н. 1953, г. Шэфілд, Вялікабрытанія), першы касманаўт Вялікабрытаніі. Скончыла Шэфілдскі ун-т. З 1989 у Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю.А.Гагарына. 18—26.5.1991 здзейсніла палёт (як кас-



манаўт-даследчык) па савецка-брытанскай праграме «Джуна» ў складзе экіпажаў касм. карабля (КК) «Саюз ТМ-12» і арбітальнай станцыі *«Мір»* (пасадка на КК «Саюз ТМ-11»). У космасе правяла 8 сут. *У.С.Ларыёнаў.*

ШАРМА́НКА, музычны інструмент; тое, што *катрынка.*

ШАРНІ́Р [франц. charnière ад лац. cardo (cardinis) кручок, пятля], рухомае злучэнне дэталей, якое ўтварае кінематычную вярчальную пару і дазваляе вярчэнне толькі вакол агульнай восі (цыліндрычны Ш.) або пункта (шаравы Ш.). Выкарыстоўваюцца ў *шарнірных механізмах.* Шаравыя Ш. ў машынах часта замяняюць *карданнымі шарнірамі.*

ШАРНІ́РНЫ МЕХАНІ́ЗМ, механізм, усе звёны якога ўваходзяць у вярчальныя кінематычныя пары *(шарніры).* Бываюць плоскія (найб. пашыраныя) і прасторавыя. Дазваляюць атрымаць складаны рух рабочага органа машыны без выкарыстання спец. прыстасаванняў (напр., злучальных звёнаў у *кулачковых механізмах*). Служаць перадатачнымі або накіроўнымі механізмамі ў тэхнал. машынах, прыладах, сродках робататэхнікі.

ШАРО́ВА Аляксандра Міхайлаўна (19.8.1936, в. Калінка Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл. — ?.8.1995), бел. вучоны ў галіне металазнаўства. Д-р тэхн. н., праф. (1992). Скончыла Кіеўскі політэхн. ін-т (1958). З 1965 у Магілёўскім машынабудаўнічым ін-це (у 1995 заг. кафедры). Навук. працы па фізіцы і тэхналогіі магнітаграфічнага метаду кантролю зварных метал. злучэнняў.

Тв.: Контроль качества сварки магнитографическим методом. Мн., 1979.

ШАРО́Н Арыэль (н. ў 1928, Кфар-Малал, Ізраіль), дзяржаўны і ваен. дзеяч Ізраіля. Ген.-маёр (1967). Ваен. адукацыю атрымаў у Вялікабрытаніі, скончыў Тэль-Авіўскі ун-т (1966). У 1940-я г. ўдзельнік яўр. самаабароны (Хаганы) у Палесціне. У час араба-ізраільскай вайны 1948—49 камандаваў брыгадай. Вызначыўся ў вайне з Егіптам 1956 (гл. *Суэцкі крызіс 1956*), араба-ізраільскіх войнах 1967 і 1973. З 1973 чл. паліт. аб'яднання «Лікуд», з 1999 яго лідэр. З 1975 саветнік прэм'ер-міністра І.*Рабіна*, з 1977 міністр сельскіх пасяленняў, у 1981—83 міністр абароны. Кіраваў увараннем ізраільскіх войск у Ліван у 1982; у сувязі з абвінавачаннямі ў няздольнасці прадухіліць масавыя забойствы мірных жыхароў у *Сабры і Шаціле* пайшоў у адстаўку. З 1984 міністр прам-сці, у 1990—92 — буд-ва і жыллёвай гаспадаркі, у 1996—98 нац. інфраструктуры, у 1998—99 — замежных спраў. У вер. 1999 наведаў Храмавую гару ў Іерусаліме, што выклікала масавыя выступленні палесцінцаў. З лют. 2001 прэм'ер-міністр Ізраіля. *В.У.Адзярыха.*

Х.Шарман.

У.Ф.Шарп.

Ф.Шарп.

Ж.Шарпак.

ШАРО́ЎКА, род малюскаў; гл. *Анцылус.*

ШАРО́Ш, намнажэнне рыхлага губчатага лёду, якое ўзнікае на вадаёмах з унутрыводнага лёду, што ўсплыў на паверхню вады. Узнікае перад ледаставам пры пераахалоджванні вады ніжэй за 0 °С пераважна на хуткаплынных рэках, ніжэй палонак і гідравузлоў. Можа рухацца ўніз па цячэнні або намнажацца пад лёдам, перагароджваць жывое сячэнне ракі, выклікаць *зажор.*

ШАРП (Sharpe) Уільям Ф. (н. 16.6.1934, г. Бостан, ЗША), амерыканскі вучоны-эканаміст. Скончыў Каліфарнійскі ун-т (1956). З 1961 выкладаў у Вашынгтонскім ун-це (з 1967 праф.), з 1968 праф. Каліфарнійскага, з 1970 Стэнфардскага ун-таў, адначасова кансультант па інвестыцыях шэрагу прыватных фірм, прэзідэнт Амер. фін. асацыяцыі (з 1980). Прапанаваў мадэль цэнаўтварэння капітальных актываў, якая дазваляе вызначыць магчымы прыбытак ад каштоўных папер, паменшыць рызыку інвестара на аснове пэўнага спалучэння актываў і пасіваў і выбару адпаведнай структуры акцый. Распрацаваў метады для папярэдняй ацэнкі здзелак і для аптымальнага размеркавання капітальных актываў («Цана капітальных актываў: Тэорыя рыначнай раўнавагі ва ўмовах рызыкі», 1964; «Тэорыя інвестыцыйнага партфеля і рынкі капіталу», 1970). Даследуе пытанні палітыкі планавання інвестыцый пенсіённых, страхавых, дабрачынных і інш. фондаў, фактары, якія ўплываюць на прыбытак ад каштоўных папер. Яго працы паслужылі асновай для развіцця тэорыі цэнаўтварэння на фін. рынках, атрымалі практычнае выкарыстанне ў розных сферах эканомікі. Нобелеўская прэмія 1990 (з Г.*Маркавіцам* і М.Х.*Мілерам*).

Тв.: Рус. пер. — Инвестиции. М., 2001 (разам з Г.Дж.Александэрам, Дж.В.Бэйлі).

Н.Г.Кісялёва.

ШАРП (Sharp) Філіп (н. 6.6.1944, г. Фалмут, ЗША), амерыканскі вучоны ў галіне малекулярнай біялогіі. Чл. Нац. АН ЗША, Амер. акадэміі мастацтваў і навук. Скончыў Ілінойскі ун-т (1969). З 1969 у Каліфарнійскім тэхнал. ін-це. З 1974 праф. Масачусецкага тэхнал. ін-та. У 1982—91 дырэктар Цэнтра анкалагічных даследаванняў. Навук. працы па праблемах рэгуляцыі экспрэсіі гена ў пазваночных. Адначасова і незалежна ад Р.*Робертса* выявіў перарывістую (экзон-інтронную) структуру гена. Нобелеўская прэмія 1993 (з Робертсам).

В.Ф.Ермакоў.

ШАРПА́К (Charpak) Жорж (н. 1.8.1924, г. Дубровіца Ровенскай вобл., Украіна), французскі фізік. Чл. Франц. АН (1985). Замежны чл. Нац. АН ЗША (1986), Рас. АН (1994). З 1932 у Францыі. Скончыў Калеж дэ Франс (1954). З 1948 у Нац. цэнтры навук. даследаванняў Францыі, у 1959—91 у Еўрапейскім цэнтры ядз. даследаванняў (Швейцарыя). Навук. працы па эксперым. фізіцы высокіх энергій, распрацоўцы сродкаў дэтэктыравання элементарных часціц. Вынайшаў шматправадную прапарцыянальную камеру (камера Ш., 1968), якая дазволіла адкрыць шэраг элементарных часціц і знайшла выкарыстанне ў медыцыне, біялогіі і прам-сці. Нобелеўская прэмія 1992.

Тв.: Рус. пер. — Электронная визуализация ионизирующего излучения с помощью ограниченного лавинного разряда в газах // Успехи физ. наук. 1993. Т. 163, № 10; Жизнь как связующая нить. Ижевск, 2001 (разам з Д.Садзінос).

М.М.Касцюковіч.

ШАРПІ́ЛАЎКА, вёска ў Гомельскім р-не, на правым беразе р. Сож. Цэнтр сельсавета і камунальнага с.-г. унітарнага прадпрыемства. За 40 км на Пд ад Гомеля. 669 ж., 338 двароў (2003). Лясніцтва, дзіцячы санаторый «Верасок». Сярэдняя школа-сад, Дом культуры,



Сферычны чатырохзвённы **шарнірны механізм.**

б-ка, аддз. сувязі. Свята-Троіцкая царква. Брацкая магіла сав. воінаў.

ША́РПЛЕС (Sharpless) Карл Бары (н. 28.4.1941, г. Філадэльфія, ЗША), амерыканскі хімік-арганік. Чл. Нац. АН ЗША (1985), Амер. акадэміі навук і мастацтваў (1984), Ганаровы чл. Каралеўскага т-ва хіміі (1998). Скончыў Станфардскі ун-т (1968). У 1970—77 і 1980—90 у Масачусецкім тэхнал. ін-це (з 1975 праф.), у 1977—80 у Станфардскім ун-це. З 1990 праф. Даследчага ін-та Скрыпса (г. Ла-Холья, ЗША). Навук. працы па распрацоўцы новых каталізатараў для арган. сінтэзу, па сінтэзе біялагічна актыўных малекул. Развіў метады асіметрычнага каталізу хіральных малекул шляхам акіслення, якія выкарыстоўваюцца для сінтэзу новых лек. сродкаў. Адкрыў новыя каталітычныя і стэхіяметрычныя рэакцыі акіслення арган. злучэнняў: асіметрычныя эпаксідацыю (1980), дыгідраксіліраванне (1988) і амінагідраксіліраванне (1996). Медаль Б.Франкліна (2001). Нобелеўская прэмія 2001 (з У.С.*Ноўлсам* і Р.*Наёры*, гл. Дадатак). *М.М.Касцюковіч.*

ШАРСНЁЎ Пётр Мяркур'евіч (н. 15.5.1932, в. Курбатаўшчына Смаленскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне земляробства і раслінаводства. Канд. с.-г. н., праф. (1998). Засл. работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1990). Скончыў БСГА (1955) і працуе там (з 1972 дэкан ф-та, у 1983—91 прарэктар). Навук. працы па распрацоўцы і ўдасканаленні тэхналогій вырошчвання збожжавых, зернебабовых культур, канюшыны, кукурузы.

Тв.: Сорные растения и меры борьбы с ними. Мн., 1987 (разам з М.І.Пратасавым, К.П.Падзёнавым); Земледелие Белоруссии. Мн., 1987 (у сааўт.).

ШАРСЦІ́Н, вёска ў Веткаўскім р-не Гомельскай вобл., каля р. Сож, на аўтадарозе Ветка—Прысно. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 19 км на ПнЗ ад г. Ветка, 35 км ад Гомеля. 513 ж., 231 двор (2003). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкія магілы сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Каля вёскі гарадзішча мілаградскай культуры і селішчы зарубінецкай і калочынскай культур і эпохі Кіеўскай Русі.

ШАРСЦЯНА́Я ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, галіна *тэкстыльнай прамысловасці* па перапрацоўцы шэрсці — натуральнай і ў спалучэнні з сінт. валокнамі. Асн. прадукцыя: камвольная, тонка- і грубасуконная тканіна, шарсцяная і паўшарсцяная пража, дываны, дывановыя вырабы, коўдры, шалі, хусткі і інш. Найб. развіта Ш.п. у Расіі, Вялікабрытаніі, Італіі, Японіі, Кітаі і інш.

На Беларусі першая суконная мануфактура працавала ў Нясвіжы з 1752. У 1760—80 пабудаваны суконныя мануфактуры ў вёсках (маёнтках) Паласна (Стаўбцоўскі р-н), Бабоўня (Капыльскі р-н), *Гродзенскія каралеўскія мануфактуры*. У канцы 18—пач. 19 ст. працавалі Слонімская суконная мануфактура (гл. *Слонімскія мануфактуры*), суконныя прадпрыемствы ў Ваўкавыску, Віцебску, Дуброўне. У сярэдзіне 19—пач. 20 ст. дзейнічалі *Парэцкая суконная фабрыка* і *Ружанскія суконныя прадпрыемствы*. У 1913 выраблена 37 тыс. пагонных метраў тканін. У 1920—30-я г. Ш.п. значна развілася. У 1940 вытв-сць шарсцяных тканін павялічылася ў параўнанні з 1913 у 7,2 раза. Найбольшая была *Якаўлевіцкая суконная фабрыка*. Пасля Вял. Айч. вайны аднаўляліся разбураныя, будаваліся новыя прадпрыемствы. Найбольшыя прадпрыемствы Ш.п. (2003): Брэсцкі дывановы камбінат (гл. «*Дываны Брэста*»), Віцебскі дывановы камбінат (гл. «*Дываны Віцебска*»), *Мінскі тонкасуконны камбінат*, *Мінскі камвольны камбінат*, *Слонімская камвольна-прадзільная фабрыка* і інш. Выраблена шарсцяных тканін у 1999 — 46 млн. м^2, у 2000 — 9 млн. м^2, у 2001 — 6 млн. м^2, у 2002 — 5 млн. м^2.

ШАРСЦЯНА́Я ТКАНІ́НА, *тканіна тэкстыльная* з шарсцяной пражы. Чысташарсцяная тканіна мае да 10%, паўшарсцяная — 10—80% інш. валокнаў.

Паводле структуры нітак (пражы) Ш.т. падзяляюць на грабенныя (камвольныя), тонка- і грубасуконныя. Грабенную ткуць з гладкай і тонкай пражы грабеннага прадзіва, яна атрымліваецца тонкая, з добра бачным малюнкам перапляцення. Суконныя атрымліваюць з пухкай і параўнальна тоўстай пражы апаратнага прадзіва. Ш.т. вызначаюцца ўстойлівасцю да выціравання, дзеяння святла і хім. ачысткі, трываласцю, гіграскапічнасцю, высокімі цеплаахоўнымі якасцямі. Дабаўленне да шэрсці сінт. валокнаў павышае зносаўстойлівасць Ш.т., але зніжае іх гіграскапічнасць і павялічвае здольнасць да пілінгавання (утварэння валакністых камячкоў на паверхні тканін). З Ш.т. шыюць верхняе адзенне — сукенкі, касцюмы, паліто, выкарыстоўваюць у тэхн. мэтах. Гл. таксама *Шарсцяная прамысловасць*.

А.А.Калмыкова.

ШАРТГО́РНСКАЯ ПАРО́ДА буйной рагатай жывёлы, шартгорн (ад англ. shorthorn каратакарогі), пародa мяснога і малочна-мяснога кірунку. Выведзена ў 18 ст. ў Вялікабрытаніі паляпшэннем мясц. каратакарогай жывёлы пры скрыжаванні з галандскімі пародамі. Пашырана ў краінах

Шартгорнская парода.

Еўропы, ЗША, Аўстраліі. Выкарыстоўвалася пры вывядзенні пародаў бястужаўскай, курганскай, санта-гертруда.

Жывёлы мяснога тыпу маюць далікатную рыхлую канстытуцыю, тулава кампактнае і шырокае, галава і шыя кароткія і шырокія, добра развіта мускулатура. У жывёл малочна-мяснога тыпу тулава падоўжанае, галава лёгкая і сухая, шыя доўгая і тонкая. Рогі кароткія, сустракаецца камоласць. Масць чырв., белая, шэрая. Маса быкоў 850—950, кароў 450—570 кг. Скараспелыя. Надой малака за год 3500—4000 кг, тлустасць 3,7—3,9%.

Шартрскі сабор.

ШАРТР (Chartres), горад у Францыі, на р. Эр. Адм. ц. дэпартамента Эр і Луар. 78 тыс. ж. (1982). Прам-сць: эл.-тэхн. і с.-г. машынабудаванне, хім., швейная, шкляная, харчовая. Цэнтр збожжавага р-на Бос. Музей прыгожых мастацтваў. *Шартрскі сабор*, Нотр-Дам (12—13 ст.; уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*), цэрквы (10—16 ст.), жылыя кварталы (12—17 ст.), ратушы (17 ст.) і інш.

ША́РТРСКІ САБО́Р, Нотр-Дам, помнік архітэктуры франц. готыкі ў г. Шартр. Пабудаваны ў 1194—1225 на месцы храма 11 ст. (захаваліся крыпты 9 і 11 ст. з фрагментамі раманскіх фрэсак). Гал. фасад (1135 — 2-я пал. 13 ст., акно-ружа пач. 13 ст.) з трайным скульпт. «Каралеўскім парталам» (1145—60) фланкіраваны паўн. (выш. 115 м; шпіль 1507—13, арх. Жан з Боса) і паўд. вежамі. Парталы трансепта аздоблены разнымі порцікамі і скульптурай на тэмы сюжэтаў са Старога і Новага запаветаў (13 ст.). У інтэр'еры захаваліся вітражы 12—13 ст., каменная

скульпт. агароджа хору (з 1514, па малюнках Жана з Боса; 18 ст.), за хорам — капэла (14 ст.; цяпер скарбніца сабора). Сабор уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*. Іл. гл. таксама да арт. *Вітраж, Готыка, Шкло мастацкае*.

ШАРУ́ХА, дуплянка шэрая, млечнік звілісты (Lactarius flexuosus), шапкавы базідыяльны грыб сям. сыраежкавых. Пашыраны ў Еўразіі

Шаруха.

і Амерыцы. На Беларусі трапляецца з ліп. па вер. у лісцевых і мяшаных лясах.

Шапка дыям. 5—10(15) см, пукатая, потым лейкападобная, з хвалістым краем, слізістая, гладкая, іржава-лілова-шэрая. Мякаць белая, шчыльная, з едкім млечным сокам, які на паветры не мяняе колеру. Пласцінкі зыходныя, патоўшчаныя. Ножка цыліндрычная, шчыльная, потым полая. Споры шарападобныя, бародаўчатыя. Ядомы грыб.

ШАРХУНЫ́, самагучальны муз. інструмент. Наз. таксама шаргунцы, шалестуны, шумёлы, бомы, бразготкі. Складаюцца з некалькіх (да 11) бронзавых (у мінулым медных) шарыкаў розных памераў са шротам унутры, з проразямі па баках і крапежным вушкам у верхняй частцы. Пры патрэсванні ўзнікае меладычнае і звонкае гучанне, у старажытнасці выкарыстоўвалі як элемент жан. ўпрыгожання. У вясельным поездзе Ш. на скураным паску чаплялі на шыю коней. З 2-й пал. 19 ст. выкарыстоўвалі як састаўны канстр. элемент *бубна*. Ш. выраблялі звычайна мясц. кавалі. Пашыраны па ўсёй тэр. Беларусі.

І.Дз.Назіна.

ШАРШАНЕ́ВІЧ Вадзім Габрыелевіч (6.2.1893, Казань, Татарстан — 18.5.1942), рускі паэт, перакладчык. Скончыў Маскоўскі ун-т. Прымыкаў да *футурызму*, у 1919—24 адзін з прадстаўнікоў *імажынізму*. Першая кніга паэзіі — «Вясновыя праталінкі» (1911). Тэарэт. погляды выклаў у працах «Футурызм без маскі» (1913), «Зялёная вуліца» (1916), «2×2=5. Лісты імажыніста» (1920) і інш. У паэт. кнігах «Рамантычная пудра», «Экстравагантныя флаконы» (абедзве 1913), «Вечны жыд» (1916), «Крэматорый» (1919), «Залаты кіпень» (1921, з А.Марыенгофам і С.Ясеніным), «Адна суцэльная недарэчнасць» (1922) і інш. урбаністычныя матывы, тэмы кахання і мастацтва. У гады грамадз. вайны разам з У.Маякоўскім пісаў тэксты для «Вокнаў РОСТА». Аўтар інсцэніровак, лібрэта, мемуараў і інш. Пераклаў «Кветкі зла» Ш.Бадлера, асобныя п'есы У.Шэкспіра, П.Карнеля, Б.Брэхта, вершы Т.Гацье, А.Рэмбо і інш.

ШАРШНЁВА Рыма Іванаўна (1925, г. Добруш Гомельскай вобл. — 6.12.1942), удзельніца партыз. руху і камсам. падполля ў Мінскай вобл. ў Вял. Айч. вайну. З ліп. 1942 сувязная-інструктар у камсам.-маладзёжным атрадзе 121-й партыз. брыгады імя А.М.Брагіна, якая дзейнічала на тэр. Мінскай і Палескай абл. Арганізоўвала камсам. падполле, удзельнічала ў баявых аперацыях партызан. 25.11.1942 у час *Ламавіцкага бою 1942* смяротна паранена.

ШАРШУНО́Ў Вячаслаў Аляксеевіч (н. 4.5.1949, в. Круглоўка Руднянскага р-на Смаленскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне с.-г. машынабудавання. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (2003), Акадэміі агр. навук Беларусі (1992), д-р тэхн. н. (1991), праф. (1992). Засл. дз. нав. Беларусі (1998). Скончыў БСГА (1971), дзе працаваў (заг. кафедры, з 1992 рэктар). З 1995 нач. упраўлення ў Мін-ве сельскай гаспадаркі і харчаваня Беларусі. З 1997 нам. старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нац. сходу Рэспублікі Беларусь, з 2000 нам. старшыні Дзярж. атэстацыйнага к-та Рэспублікі Беларусь. З 2003 рэктар Магілёўскага ун-та харчавання. Навук. працы па пытаннях распрацоўкі і ўкаранення энергазберагальных тэхналогій, камплектаў машын і абсталявання для ўборкі, перапрацоўкі і выкарыстання ўраджаю с.-г. культур на насенне і корм жывёлам, а таксама па гісторыі навукі, тэхнікі і адукацыі на Беларусі.

Р.І.**Шаршнёва.**

В.А.**Шаршуноў.**

Тв.: Механизация обработки и внесение органических удобрений. Мн., 1993 (разам з С.І.Назаравым); Практикум по машинному доению коров и обработке молока. Мн., 1998 (разам з Р.П.Цыганком); Комбикорма и кормовые добавки: Справ. пособие. Мн., 2002 (у сааўт.); Механизация приготовления комбикормов. Мн., 2003 (у сааўт.); Как подготовить и защитить диссертацию: История, опыт, методика и рекомендации. Мн., 2003 (разам з Н.У.Гулько).

ШАРШЭ́ЎСКІ Рыгор Юдэлевіч (1.9.1913, г. Растоў-на-Доне, Расія — 6.8.1991), бел. піяніст, педагог. Засл. дз. маст. Беларусі (1983). Скончыў Ленінградскую кансерваторыю (1936). З 1939 выкладчык Бел. кансерваторыі (з 1984 праф.) і спец. муз. школы пры кансерваторыі. Адначасова ў 1939—63 вёў канцэртную дзейнасць. У рэпертуары творы рус. і замежнай класікі, сучасныя муз. творы. Сярод вучняў Л.*Максімава*, І.*Палівода*, В.*Рахленка*, Л.*Талкачова*, І.*Шуміліна*, а таксама кампазітары Г.*Вагнер*, І.*Лучанок*, Э.*Тырманд* і інш.

М.Р.Солапаў.

ША́РЫ (Chari, Shari), рака ў Цэнтр. Афрыцы. Утвараецца зліццём рэк Уам і Грыбінгі, якія пачынаюцца ў Цэнтральнаафрыканскай Рэспубліцы; большая ч. цячэння ў межах Рэспублікі Чад (часткова з'яўляецца граніцай паміж Чадам і Камерунам). Упадае ў воз. *Чад*, з прытокам Лагоне ўтварае агульную дэльту. Даўж. (ад вытокаў р. Уам) 1450 км, пл. бас. каля 700 тыс. км^2. Паводка ў летні дажджлівы сезон, у сярэднім і ніжнім цячэнні — у асеннія месяцы. Сярэдні расход вады 1230 м^3/с. Суднаходная ад г. Батангафа на р. Уам (больш за 860 км). Рыбалоўства. На Ш. — г. Нджамена (сталіца Чада).

Шархуны.

ШАРЫ́ГІН Павел Паліеўктавіч (28.4.1881, с. Горкі Уладзімірскай вобл., Расія — 29.4.1939), расійскі хімік-арганік. Акад. АН СССР (1939, чл.-кар. 1932). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча (1906). У 1903—06 у Фрайбургскім ун-це, у 1925—39 праф. Маскоўскага хіміка-тэхнал. ін-та. З 1931 навук. кіраўнік Маск. НДІ штучнага валакна. Навук. даследаванні па хіміі металаарган. злучэнняў і вугляводаў. Адкрыў рэакцыю «металявання» вуглевадародаў і іх вытворных. Распрацоўваў тэарэт. і практ. пытанні цэлюлозна-папяровай і сінт. валакна вытв-сцей.

Тв.: Избр. труды. М.; Л., 1950.

ША́РЫЙ Валерый Пятровіч (н. 2.1.1947, г. Чэрвень Мінскай вобл.), бел. спартсмен (цяжкая атлетыка). Засл. майстар спорту СССР (1975). У 1980—82 і 1988—91 ст. трэнер БВА па цяжкай атлетыцы. У 1982—87 трэнер у складзе групы сав. войск у Германіі. У 1994—2001 трэнер нац. зборнай каманды Беларусі па цяжкай атлетыцы, з 2001 трэнер Мінскай абл. школы вышэйшага спарт. майстэрства. Чэмпіён XXI Алімп. гульняў (1976, г. Манрэаль, Канада), свету (1975, Масква; 1976, Манрэаль), Еўропы (1975, Масква; 1976, Берлін). Сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы (1980, Бялград), бронз. прызёр (1979, Сафія). Чэмпіён Еўропы сярод ветэранаў (1994, г. Шробенгаўзен, Германія). Чэмпіён VI і VII Спартакіяд народаў СССР (1975, Вільнюс; 1979, Ленінград). Пераможца першынства СССР сярод моладзі (1967, Талін), чэмпіён СССР (1971—79). Уладальнік Кубка СССР (1978, 1979). Пераможца міжнар. турніраў: «Кубак Балтыкі» (1969, 1972, 1978), «Кубак Дружбы» (1979). Выступаў у сярэдняй і ў 1-й паўцяжкай вагавых катэгорыях. Устанавіў 13 рэкордаў свету, 15 рэкордаў СССР (1971—79).

Літ.: Катюшенко М. Легкий на подъем // Олимп-76. М., 1976; Мясников А. Эта нелегкая тяжелая атлетика // Белорусские олимпийцы. Мн., 1978; Зейналов А.А., Цивес И.Л. Белорусские богатыри. Мн., 1979; Ясный Э.М. Власть над судьбой и металлом. Мн., 1994. *М.Я.Вінічонак.*

ШАРЫ́ПАВА Фарыда Шарыпаўна (н. 16.12.1936, г. Чугучак, Кітай), казахская актрыса. Нар. арт. Казахстана (1976). Нар. арт. СССР (1980). Засл. дз. культ. Кыргызстана (1994). Скончыла тэатр. ф-т пры Каз. кансерваторыі (1959). З 1959 у Каз. т-ры драмы імя М.Аўэзава. Сярод роляў: Карлыга («Кабланды» Аўэзава), Акбала («Кроў і пот» А.Нурпеісава), Талганай, Джаміля («Мацярынскае поле», «Песня мая жаданая» Ч.Айтматава), Алена Андрэеўна («Дзядзька Ваня» А.Чэхава). Дзярж. прэмія Казахстана 1966. Дзярж. прэмія СССР 1974.

А.І.Клімовіч.

ШАРЫ́ПА Пётр Пятровіч (н. 11.4.1942, в. Арашкі Аршанскага р-на Віцебскай вобл.), бел. жывапісец. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1974). З 1974 выкладае ў Бел. каледжы мастацтваў. Працуе ў розных жанрах станковага жывапісу. Творы вызначаюцца напружаным колеравым вырашэннем, эмацыянальнасцю, рытмічнасцю тонавых спалучэнняў: «Людміла» (1969), «Летняе акно» (1972), «Нясвіж» (1976), «Алёна», «Лісты бацькі» (абодва 1977), «Маці» (1980), «Вёсачка Укля» (1981), «Песня маці», «Светлы дзень» (абодва 1982), «Старыя дрэвы» (1984), «Вясна» (1985), «Вясновае серабро» (1987), «Касцёл францысканцаў. Гальшаны» (1989), «Нацюрморт з кафляй 17 ст. з выявай Юрыя Глябовіча — уладальніка Заслаўя» (1990), «Развітанне з роднай вёскай» (1992), «Навальніца» (1999), «Свіцязянская балада. А.Міцкевіч» (2000) і інш. *Л.Ф.Салавей.*

П.**Шарыпа**. Летняе акно. 1972.

ШАРЫ́ЯТ (ад араб. шарыя — правільны шлях), комплекс мусульманскіх юрыд. норм, прынцыпаў і правіл паводзін. Выкладзены ў *Кагане, суне* і інш. рэліг. творах. У Каране Ш. азначае шлях, трымаючыся якога мусульманін трапляе ў рай. Лічыцца, што выкладзены для людзей Алахам праз прарока Мухамеда. Канчатковую форму набыў у 11—12 ст. Паводле мусульм. уяўленняў, Ш. — вечны і нязменны божы закон, у якім прадугледжаны ўсе выпадкі жыцця і змешчаны ўсе рэліг., маральныя, юрыд., быт. нормы і звычаі. Паводле тэарэтыкаў *ісламу*, Ш. — агульны арыенцір, які не дае адназначных адказаў, але яго рацыянальнае асэнсаванне даззваляе знайсці правільнае вырашэнне любой канкрэтнай праблемы. Складаецца з ібадату (знешнія формы адносін людзей да Бога), муамаляту (правілы адносін людзей паміж сабой) і ікубату (пакаранне за парушэнне правіл). Асн. праблемы Ш. распрацаваны ў фіхху (мусульм. правазнаўстве). На практыцы Ш. рэалізуецца ў мусульм. (шарыяцкіх) судах. У многіх мусульм. краінах сфера дзеяння Ш. звужана за кошт увядзення свецкіх норм права.

ШАРЭ́НГА (ад польск. szereg), строй, у якім ваеннаслужачыя размешчаны на адной лініі адзін каля аднаго з інтэрвалам, устаноўленым *статутам страявым* або ўказаным камандзірам. Пры двухшарэнгавым страі ваеннаслужачыя адной Ш. размешчаны ад другой Ш. на дыстанцыі аднаго кроку.

ШАРЭ́ЦКІ Сямён Георгіевіч (н. 23.9.1936, в. Лаўрышава Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл.), дзяржаўны дзеяч Беларусі, вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1984), праф. (1989), акад. Акадэміі агр. навук Рэспублікі Беларусь (1996) і Укр. акадэміі агр. навук, чл.-кар. Рас. с.-г. акадэміі. Скончыў Бел. с.-г. акадэмію (1959), Мінскую вышэйшую парт. школу (1970). У 1959—70 і 1984—92 старшыня калгасаў у Навагрудскім, Валожынскім р-нах. У 1970—84 старшы выкладчык, заг. кафедры Мінскай вышэйшай парт. школы. У 1993—94 саветнік Старшыні СМ Рэспублікі Беларусь. У 1996 Старшыня Вярх. Савета Рэспублікі Беларусь. З 1999 у Літве, з 2001 у ЗША. Аўтар кн. «Наш беларускі дом» (1999).

ШАР'ЯЖ, тое, што *покрыва тэктанічнае*.

ШАСІ́ (франц. châssis ад лац. capsa скрыня, умяшчальня), рама або аснова розных машын, механізмаў, апаратаў.

Ш. аўтамабіля і трактара — сабраны камплект агрэгатаў трансмісіі, хадавой часткі і механізмаў кіравання. Рамныя Ш. рухаюцца на ўласных колах або гусеніцах *(самаходныя шасі)*. Ш. самалёта — 2- і многаколавыя, палазковыя, лыжныя, паплаўковыя, гусенічныя, на паветранай падушцы. Служаць для ўзлёту і пасадкі самалёта, руху яго па зямлі, палубе карабля ці вадзе. Ш.-панэль — аснова з ліставога металу (напр., алюмінію) або ізаляцыйнага матэрыялу (напр., гетынаксу), на якой змацаваны асн. дэталі радыёэлектроннай апаратуры (радыёпрыёмніка, тэлевізійнай устаноўкі, блока ЭВМ і інш.). *В.М.Кандрацьеў.*

Трактарныя **шасі**: 1 — самаходнае ВТЗ-30СШ (Расія); 2 — самаходнае поўнапрывадное МТЗ-084 «Беларусь».

ШАСНА́ЦЦАТЫ З'ЕЗД КП(б)Б. Адбыўся 10—19.6.1937 у Мінску ў разгар *рэпрэсій палітычных*. Прысутнічала 698 дэлегатаў з рашаючым і 148 з дарадчым голасам ад 47 000 чл. і канд. у чл. партыі [разам з вайсковымі арг-цыямі; 33 578 чл. і канд. у чл. КП(б)Б]. Парадак дня: справаздачныя даклады ЦК КП(б)Б (В.Ф.Шаранговіч), Рэвіз. камісіі КП(б)Б (Р.С.Кудзельскі); выбары ЦК КП(б)Б, Рэвіз. камісіі КП(б)Б. З'езд падвёў вынікі развіцця нар. гаспадаркі рэспублікі за час пасля *Пятнаццатага з'езда КП(б)Б*. Было адзначана, што аб'ём валавой прадукцыі ўдвая перавысіў узровень 1932; удзельная вага ў ёй прамысл. прадукцыі дасягнула 73%. У калгасы аб'ядналася 87,1% сял. гаспадарак, якія засявалі 94,1% ворнай зямлі. З'езд вызначыў мерапрыемствы па далейшым развіцці нар. гаспадаркі, асабліва энергетыкі, умацаванні калгасаў, павышэнні ўзроўню гасп. і паліт. работы, даў даручэнні па распрацоўцы паказчыкаў 3-га пяцігадовага плана. Аднагалосна са спісу дэлегатаў быў выключаны і арыштаваны як «вораг народа» б. Старшыня СНК БССР М.М.Галадзед. Некалькі дэлегатаў, якія працавалі разам з ім, таксама арыштаваны ў ходзе з'езда. Не вытрымаўшы неабгрунтаваных абвінавачанняў у выццам бы дачыненні да «варожай дзейнасці ў Беларусі», дэлегат з'езда Старшыня ЦВК БССР і чл. Бюро ЦК КП(б)Б А.Р.Чарвякоў 16 чэрв. ў час перапынку застрэліўся ў сваім кабінеце. З'езд выбраў ЦК КП(б)Б з 64 чл. і 21 канд., Рэвіз. камісію КП(б)Б з 7 чл. У Бюро ЦК КП(б)Б, выбранае на арганізац. пленуме, увайшло 11 чл. і 7 канд., якія ў хуткім часе, акрамя аднаго кандыдата, былі арыштаваны і прыгавораны да вышэйшай меры пакарання; на пач. 1938 былі арыштаваны і прыгавораны да вышэйшай меры пакарання 34 з 64 чл. і 8 з 21 канд. у чл. ЦК КП(б)Б.

Літ.: Шаранговіч В.Ф. Справаздача Цэнтральнага Камітэта КП(б) Беларусі XVI з'езду КП(б)Б // Бальшавік Беларусі. 1937. № 6; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 3. 1933—1945. Мн., 1985; Платонаў Р. Палітыкі. Ідэі. Лёсы: Грамадзян. пазіцыі ва ўмовах нарастання ідэолага-паліт. дыктату ў Беларусі 20—30-х гг. Мн., 1996.

Р.П.Платонаў.

ШАСНАЦЦАЦІРАДКО́ЎЕ, страфа, якая складаецца з 16 вершаваных радкоў, завершаных па метрычным, інтанацыйна-сінтаксічным малюнку і па думцы. Складаецца звычайна з 4 *чатырохрадкоўяў* з перакрыжаванай, сумежнай або апяразанай рыфмоўкай. Могуць быць і інш. варыянты страфічнай арганізацыі, але ўсе радковыя групы заўсёды цесна звязаны паміж сабой рыфмамі, сінтаксісам, памерам, інтанацыяй, адзінствам паэт. думкі. У бел. паэзіі Ш. створана А.Куляшовым і выкарыстана ім у монастрафічных вершах-шаснаццацірадковіках (цыкл «Новыя вершы») і ў паэмах «Маналог», «Цунамі». *В.П.Рагойша.*

ШАСТА́К, 1) бел. і ўкр. назва манеты наміналам у 6 *грошаў* у 16—18 ст. 2) Расійская білонная манета, якая прызначалася для забеспячэння плацежаздольнасці арміі Пятра I на тэр. Беларусі, Украіны і Польшчы ў час Паўночнай вайны 1700—21. За эталон для чаканкі ўзята манета Рэчы Паспалітай у 6 грошаў. Афіцыйна ўстаноўленыя проба і лігатурная маса пры выпуску былі паменшаны (метрычная проба найменшая 210, маса 2,95 г). Рыначны курс абарачэння — 4 капейкі. Такі Ш. выпускалі Кадашаўскі і Красны манетныя двары ў 1707 і, магчыма, у 1708 штэмпелямі 1707.

С.Г.Шарэцкі.

Дз.Дз.Шастаковіч.

«ШАСТА́К», бел. нар. танец. Муз. памер 2/4. Выканаўцы кружацца папераменна то ў хуткім, то ў павольным тэмпе (часам к фіналу тэмп паступова паскараецца). Танец пашыраны ў зах. і паўд. раёнах Беларусі.

ШАСТА́К Фёдар Віктаравіч (н. 4.1.1945, в. Харошча Іванцэвіцкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. мастак дэкар.-прыкладнога мастацтва. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1974). З 1974 мастак Івянецкай ф-кі маст. керамікі і вышыўкі, дзе распрацаваў шэраг эталонаў маст. вырабаў, з 1979 заг. Н.-д. маст.-эксперым. лабараторыі ў Мінску, у 1983—2002 на Барысаўскім маст. камбінаце. Сярод твораў: дэкар. скульптура «Певень»; трыпціхі «Край мой родны», «Івянецкія майстры», «Зубр», «Ікар», «Пегас» (усе 1976), «Да зорак» (1978), «Марына» (2002); дэкар. кампазіцыя «Хваля» (1978—79), вазы, талеркі, свяцільні для інтэр'ера рэстарана ў г. Талачын Віцебскай вобл. (1982); пласты «Магілёў», «Гомель» для залы пасяджэнняў рэзідэнцыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (1999); каміны і печы для музея-сядзібы А.Міцкевіча ў в. Завоссе Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. (1998). Творы вылучаюцца арганічнасцю спалучэння традыц. і сучасных форм. *Л.Ф.Салавей.*

ШАСТАКО́ВІЧ Дзмітрый Дзмітрыевіч (25.9.1906, С.-Пецярбург — 9.8.1975), расійскі кампазітар, піяніст, педагог, грамадскі дзеяч; класік сусв. муз. культуры 20 ст. Продкі паходзяць з Вілейшчыны. Нар. арт. СССР (1954). Герой Сац. Працы (1966). Д-р мастацтвазнаўства (1965), праф. (1939). Ганаровы чл. многіх замежных акадэмій, ганаровы д-р Оксфардскага (1958), Паўн.-Зах. (г. Эванстан, ЗША, 1973) ун-таў, Франц. акадэміі прыгожых мастацтваў (1975). Скончыў Ленінградскую кансерваторыю (кл. фп. 1923; кл. кампазіцыі 1925), у 1937—41 выкладаў у ёй, у 1943—48 у Маскоўскай кансерваторыі. Разнастайнай па жанрах і індывід. па стылі творчасці Ш. ўласцівы філас. асэнсаванне сац. канфліктаў і псіхал. калізій сучаснасці, супярэчлівае адзінства вобразнага свету, этычная накіраванасць. Для твораў да 2-й пал. 1930-х г. характэрны мадэрнісцкія тэндэнцыі, перавага муз.-тэатр. жанраў; 1937—64 — перыяд манум. сімфоній грамадз. зместу; творчасць апошняга дзесяцігоддзя жыцця адметна дамінаваннем камерных жанраў, тэмы жыцця, смерці, бессмяротнасці. У найб. паказальным жанры Ш. — 15 сімфоніях (1925—71; у т.л. 7-я — помнік гераізму сав. народа ў Вял. Айч. вайну, 1941) — сфарміравалася ўласная сімф. канцэпцыя. На сцэнах многіх краін свету пастаўлены яго оперы — своеасаблівыя тэатр. сімфоніі — «Нос» (паводле М.Гогаля, паст. 1930) і «Лэдзі Макбет Мцэнскага павета» («Кацярына Ізмайлава», паводле М.Ляскова, паст. 1934, 2-я рэд. 1956, паст. 1963; на сцэне Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі 1994). Антырамантычная, мюзік-хольная эстэтыка вызначае наватарскую трактоўку балетаў Ш. «Залаты век» (паст. 1930), «Болт» (1931), «Светлы ручай» (1935). Лірычным дзённікам сталі 15 стр. квартэтаў (1938—74). Сярод інш. значных твораў: вакальна-сімф. паэма «Пакаранне смерцю Сцяпана Разіна» (1964); канцэрты для фп., скр., віяланчэлі з арк.; інстр. ансамблі з фп. «Трыо», «Квінтэт»; фп. цыкл «24 прэлюдыі і фугі»; вак. цыклы на вершы А.Пушкіна, англ. паэтаў, Сашы Чорнага, М.Цвятаевай, А.Блока, Мікеланджэла; музыка да драм. спектакляў і кінафільмаў, у т.л. «Авадзень», «Гамлет», «Кароль Лір». Неаднаразова прысутнічаў на прэм'ерах сваіх твораў у Мінску, у т.л. 13-й сімфоніі ў выкананні Дзярж. акад. сімф. аркестра Беларусі і Хору Бел. тэлебачання і радыё (1963). Творчасць Ш. паўплывала на аднаўленне нац. стылю ў бел. музыцы 2-й пал. 20 ст., на драматургію сімфоній Л.Абеліёвіча, Я.Глебава, Дз.Смольскага, опер С.Картэса. На аснове тэмы-манаграмы Ш. створаны мемарыяльныя творы Смольскага, В.Войціка. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1942, 1946, 1950, 1952, 1968. Міжнар. прэмія Міру 1954. Ленінская прэмія 1958. Міжнар. прэмія Я.Сібеліуса 1958. Дзярж. прэмія Расіі 1974. Дзярж. прэмія Украіны 1976.

Тв.: Д.Шостакович о времени и о себе. М., 1980.

Літ.: Д.Шостакович. М., 1967; Данилевич Л. Д.Шостакович: Жизнь и творчество. М., 1980; Сабинина М. Д.Шостакович—симфонист. М., 1976; Д.Шостакович: Ното-

граф. справ. М., 1976; Хентова С.М. Д.Шостакович: Жизнь и творчество. Т. 1—2. Л., 1985—86; Д.Шостакович: Сб. статей к 90-летию со дня рождения. СПб., 1996; Шостакович: Между мгновением и вечностью: Док. Материалы. Статьи. СПб., 2000.

Р.М.Аладава.

ШАСТАКО́Ў Аляксандр Цімафеевіч (н. 23.6.1940, г. Капейск Чэлябінскай вобл., Расія), бел. жывапісец. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1975). Творы вылучаюцца тонкасцю колеравых нюансаў, мяккім каларытам, лірычнасцю: «Мая маці», «Партрэт бацькі» (абодва 1970), «Сланечнікі» (1971), «Партрэт Л.Бржазоўскай» (1978), «Сонечны двор» (1979), «Аголеная ў інтэр'еры», «Дачка Алена» (абодва 1981), «Зімовы дзень» (1984), «Вязынка» (1988), «Епіскап Канстанцін» (1990), «Манахіня» (1993), «За парадай да старца» (1997), «Мастак Мікалай Кліменкаў» (2002), «Закаханая (Венера)» (2003).

Л.Ф.Салавей.

ШАСТО́ЎСКІ Кім Фёдаравіч (н. 2.10.1935, в. Ляўкі Аршанскага р-на Віцебскай вобл.), бел. мастак. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1965). У 1966—89 выкладаў у Мінскім маст. вучылішчы. Аўтар тэматычных карцін: «На вытворчасці. Кавалі» (1967), «Развітанне» (1973), «Трывожная зіма. Пагранічнікі», «Размова» (абедзве 1977), «Я.Купала ў Ляўках» (1982), «1944 год. Пад Оршай» (1984), «На жніве» (1986), «Арышт І настаўніцкага з'езда. Я.Колас» (1989), «Праводзіны зімы» (1990); партрэтаў «Хлопчыкі каля акна» (1975), А.Пісаравай (1983), М.Зяленкіна (1985), «Косця» (1986) і інш.; лірычных пейзажаў «Над Дняпром» (1966), «Восеньскі матыў» (1973), «Восень» (1976), «Снежань. Зімовыя ўзоры» (1982), «Браслаўскія далі» (1984), «Бераг мора» (1995), «Падніколле. Паводка ў Магілёве» (2001), «Сенажаць у Заслаўі» (2002) і інш.; гарфічных работ. Творы вылучаюцца вобразнасцю, выразнасцю малюнка і колеравага вырашэння, кампазіцыйнай раўнавагай.

Л.Ф.Салавей.

А.Шастакоў. Закаханая (Венера). 2003.

ШАСТАКО́Ў Міхаіл Дзянісавіч (3.11.1907, в. Нача Крупскага р-на Мінскай вобл. — 12.5.1942), Герой Сав. Саюза (1942). Скончыў Аб'яднаную ваен. школу (1931), камандныя курсы пры Ваен. акадэміі механізацыі і матарызацыі РСЧА. У Чырв. Арміі з 1928. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Паўд.-Зах. фронце. Танк. батальён на чале з капітанам Ш. вызначыўся 12.5.1942 у баі каля г. Харкаў (Украіна): фарсіраваў р. Бабка, захапіў у палон шмат гітлераўцаў з узбраеннем; у баі за с. Непакрытае паланіў батальён варожай пяхоты, асабіста Ш. пры адбіцці контратакі праціўніка агнём з танка знішчыў 4 гарматы з разлікамі, вызваліў сяло. Загінуў у гэтым баі. Яго імем названа вуліца ў в. Нача.

ШАСТАПЁР, від *халоднай зброі* ўдарнага дзеяння; разнавіднасць *булавы* з галоўкай з 6 метал. пласцін — «пёраў» (адсюль назва). Колькасць «пёраў» часам памяншалі да 4 або павялічвалі да 8. Найб. пашырэнне Ш. атрымаў у 15—17 ст. Служыў таксама знакам улады военачальнікаў, пры гэтым «пёры» Ш. ўпрыгожваліся чаканкай, серабром, золатам і каштоўнымі камянямі.

ША́СТРЫ Лал Бахадур (2.10.1904, г. Мугалсарай, Індыя — 11.1.1966), індыйскі дзярж. і паліт. дзеяч. Скончыў ун-т у г. Бенарэс (цяпер Варанасі). Удзельнік інд. нац.-вызв. руху супраць брыт. панавання, паслядоўнік М.*Гандзі*, паплечнік Дж.*Нэру*. З 1930-х г. у кіраўніцтве партыі *Індыйскі нацыянальны кангрэс* (ІНК), з 1951 — яе ген. сакратар. У незалежнай Індыі ў 1952—63 неаднаразова займаў міністэрскія пасады ў цэнтр. урадзе. Пасля смерці Нэру (чэрв. 1964) лідэр парламенцкай фракцыі ІНК і прэм'ер-міністр краіны, адначасова міністр па пытаннях атамнай энергіі і старшыня Планавай камісіі. Памёр у СССР, дзе знаходзіўся ў сувязі з ташкенцкімі перагаворамі кіраўнікоў Індыі і Пакістана аб урэгуляванні індапакістанскага канфлікту.

ШАСЦЕРЫКО́Ў Пётр Паўлавіч (4.5.1919, в. Тоўсты Луг Суджанскага р-на Курскай вобл., Расія — 20.3.1994), бел. пісьменнік. Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1941). У 1946—56 працаваў у газ. «Звязда», у 1960—71 сакратар Магілёўскага абл. аддз. Саюза пісьменнікаў Беларусі, з 1973 упаўнаважаны Усесаюзнага агенцтва па аўтарскіх правах па Магілёўскай вобл. Друкаваўся з 1941. Пісаў на рус. і бел. мовах. Аповесці «Камень за каменем» (1953), «Сонечны прамень» (1961) пра маладых рабочых. Падзеі Вял. Айч. вайны ў зб. апавяданняў «На ўсё жыццё» (1962). Аповесць «Звіні, званок!» (1957) пра школьнае жыццё. Аўтар нарыса «А слава цябе знойдзе» (1964).

Тв.: Повести и рассказы. Мн., 1979.

«ШАСЦЁРКА», творчая садружнасць франц. кампазітараў-наватараў, якая склалася пасля 1-й сусв. вайны і існавала ў 1920-я г. ў складзе: ідэолагі Ж.Както, Э.Саці, члены А.Анегер, Ж.Арык, Л.Дзюрэй, Д.Міё, Ф.Пуленк, Ж.Тайфер. Розных па творчых установоўках кампазітараў аб'ядноўвала імкненне да навізны і адначасова да прастаты, канструктыўнай яснасці муз. мовы, непрыняцце музыкі *імпрэсіянізму*.

Літ.: Дюменіль Р. Современные французские композиторы группы «Шести»: Пер. с фр. Л., 1964.

ШАСЦІРАДКО́ВІК, верш з 6 вершарадоў, завершаных па метрычным, інтанацыйна-сінтаксічным малюнку і па думцы. Вызначаюцца паглыбленым лірычным роздумам, афарыстычнасцю паэт. выказвання. Рыфмоўка ў ім можа быць розная: ААББВВ, аБаБвв і інш., напр.:

О, колькі ў нас нянек у літаратуры,
Дарадчыкаў і невясёлых і хмурых,
Прыхільнікаў розных сіропаў і сосак,
Ахоўнікаў сцёртых пытальнікаў, косак,—
Што часам шукае ў натоўпе рука
Сустрэць хоць бы нейкага ерэтыка.
(М.Танк. «О, колькі ў нас нянек у літаратуры...»)

В.П.Рагойша.

ШАСЦІРАДКО́ЎЕ, секстэт, страфа з 6 вершаваных радкоў, звязаных 2, 3 ці 1 рыфмамі або толькі клаўзуліямі (у *белым вершы*). Найчасцей у Ш. сустракаюцца наступныя схемы рыфмоўкі: абабвв, аБаБаБ *(секстына)*, ААбВВб *(рансарава страфа)*, ааббвв і інш., напр.:

І прад высокаю красою,
Увесь зачараваны ёй,
Скланіўся я душой маёй,
Натхнёнай, радаснай такою,
А ў сэрцы хораша было,
Там запалілася святло.
(М.Багдановіч. «Вераніка»)

Ш. шырока карыстаўся Я.Колас («Партызанская песня», «Наша сяло» і інш.). Ш. можа выступаць і ў выглядзе монастрафы (гл. *Шасцірадковік*).

В.П.Рагойша.

ШАСЦЯРНЯ́, у *зубчастай перадачы* кола з меншым лікам зубоў, а пры роўнай іх колькасці — вядучае зубчастае кола.

ШАТАБРЫЯ́Н (Châteaubriand) Франсуа Рэнэ дэ (4.9.1768, г. Сен-Мало, Францыя — 4.7.1848), французскі пісьменнік, дзярж. дзеяч. Вучыўся ў калежах Доля і Рэна. З 1786 на ваен. службе, у 1792 выступіў на баку раялістаў, у 1793—1800 у эміграцыі (Вялікабрытанія). У перыяд Рэстаўрацыі займаў роз-

ныя дзярж. пасады. Літ. дзейнасць пачаў пасля 1830. Прадстаўнік *рамантызму*. У трактаце «Даследаванне аб рэвалюцыях» (1797) адмаўляў рэв. і дэмакр. ідэі; у «Геніі хрысціянства» (1802) выступіў апалагетам каталіцызму. Аўтар аповесцей «Атала, ці Каханне двух дзікуноў у пустыні» (1801), «Рэнэ, ці Вынікі страсцей» (1802), эпапей у прозе «Мучанікі» (1809), «Натчэзы» (1826) і інш. Філас. і літ.-эстэт. погляды абагульніў у аўтабіягр. «Замагільных запісках» (выд. 1848—50).

Тв.: Рус. пер. — Рене: История последнего из Абенсераджей // Французская новелла XIX в. М.; Л., 1959. Т. 1; Атала // Французская романтическая повесть. Л., 1982; Гений христианства: [Фрагменты] // Эстетика раннего французского романтизма. М., 1982.

Літ.: Моруа А. Литературные портреты: Пер. с фр. М., 1971.

М.Дз.**Шастакоў**.

У.А.**Шаталаў**.

ШАТА́ЛАЎ Уладзімір Аляксандравіч (н. 8.12.1927, г. Петрапаўлаўск, Казахстан), савецкі касманаўт. Двойчы Герой Сав. Саюза (1969). Лётчык-касманаўт СССР (1969). Ген.-лейт. авіяцыі (1975). Канд. тэхн. н. (1972). Скончыў спец. школу ВПС (1945), Качынскае вышэйшае ваен. авіяц. вучылішча (1949), Ваенна-паветр. акадэмію (1956). У 1963—91 у Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю.А.Гагарына (з 1987 нач.). 14—17.1.1969 здзейсніў палёт на касм. караблі (КК) «Саюз-4» (стыкоўка з КК «Саюз-5»), 13—18.10.1969 з А.С.*Елісееевым* — палёт на КК «Саюз-8», 23—25.4.1971 з Елісеевым і М.М.*Рукавішнікавым* — палёт на КК «Саюз-10» (стыкоўка з арбітальнай станцыяй *«Салют»*), ва ўсіх палётах як камандзір. У космасе правёў 9,9 сут. Дзярж. прэмія СССР 1981. Залатыя медалі імя К.Э.Цыялкоўскага АН СССР і імя Гагарына (ФАІ). Яго імем названы кратэр на Месяцы.

Тв.: Люди и космос. М., 1975 (разам з М.Ф.Рабровым); Космос — Земле. М., 1981; Трудные дороги космоса. 2 изд. М., 1981.

У.С.Ларыёнаў.

ШАТА́ЛІН Станіслаў Сяргеевіч (24.8.1934, г. Пушкін Ленінградскай вобл., Расія — 1997), расійскі вучоны-эканаміст. Акад. АН СССР (1987, чл.-кар. 1974). Скончыў Маскоўскі ун-т (1958). З 1959 у Н.-д. эканам. ін-це пры Дзяржплане СССР, Цэнтр. эканоміка-матэм. ін-це АН СССР, у НДІ сістэмных даследаванняў Дзярж. к-та па навуцы і тэхніцы і АН СССР, у Маскоўскім ун-це. Навук. працы па тэорыі і метадалогіі сістэмнага аналізу, яго выкарыстанні для вырашэння сац.-эканам. і навук.-тэхн. праблем. Дзярж. прэмія СССР 1968.

Тв.: Функционирование экономики развитого социализма: Теория, методы и пробл. М., 1982; Культура и средства массовой информации: социально-экон. пробл. М., 1985 (у сааўт.); Интенсификация общественного производства: социально-экон. пробл. М., 1987 (разам з В.Р.Грабеннікавым, А.С.Пчалінцавым); Организация управления: Пробл. перестройки. М., 1987 (у сааўт.); Экономическая реформа: причины, направления, пробл. М., 1989 (разам з Я.Ц.Гайдарам); Социальные ресурсы и социальная политика. М.,1990 (у сааўт.).

«ШАТЛ», касмічны карабель, гл. *«Спейс шатл»*.

ШАТЛА́НДСКАЯ ШКО́ЛА, кірунак у філасофіі Вялікабрытаніі 2-й пал. 18 — 1-й пал. 19 ст. Заснавальнік — Т.Рыд. Яе прадстаўнікі (Дж.Освальд, Дж.Біты, Д.Сцюарт, Дж.Макінташ, У.Гамільтан) імкнуліся стварыць філасофію «цвярозага розуму» ў якасці альтэрнатывы саліпсізму Д.Юма і суб'ектыўна-ідэаліст. суджэнням Дж.Берклі. У процівагу абстрактна-тэарэт. вучэнням гэтых філасафаў яны абвясцілі асн. катэгорыяй філасофіі «цвярозы розум» як пэўную суму непарушных ісцін, крыніцай якіх з'яўляецца непасрэдная унутр. верагоднасць, што бярэ свой пачатак ад самога Бога, таму што дзякуючы яму яна стала неабходнай часткай чалавечай прыроды. Прадстаўнікі Ш.ш. ставілі пад сумненне навук. характар філасофіі, распрацоўвалі сістэму доказаў існавання Бога, душы, мэтазгоднасці ўсяго існага і адначасова абаранялі ад нападкаў суб'ектыўнай філасофіі філас. палажэнне аб існаванні незалежнага ад свядомасці матэрыяльнага свету. Асн. месца ў іх філас. канцэпцыі належыць сцвярджэнню існавання відавочных рэліг. і маральных ісцін, што крытыкаваліся філосафамі-матэрыялістамі. *В.І.Боўш.*

ШАТЛА́НДЫЯ (Scotland), адм.-паліт. частка (гістарычная правінцыя) Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўн. Ірландыі. Займае паўн. ч. в-ва Вялікабрытанія і прылеглыя а-вы: Гебрыдскія, Аркнейскія, Шэтлендскія. Пл. 78,8 тыс. км^2, у т.л. пл. сушы 77,2 тыс. км^2. Нас. 5,13 млн. чал. (1996), пераважна шатландцы. У складзе Ш. 9 раёнаў і 3 астраўныя тэрыторыі. Гал. горад — *Эдынбург*. Найб. гарады: Глазга, Абердзін, Данды. У рэльефе пераважаюць нагор'і, найб. — Паўн.-Шатландскае (выш. да 1343 м, г. Бен-Невіс). Клімат умераны, марскі. Густая рачная сетка. Шмат азёр (Лох-Ломанд, Лох-Нес і інш.) Пашыраны верасовыя пусткі. Асн. галіны прам-сці: чорная металургія, алюмініевая, машынабудаванне (аўтамабілебудаванне; электроннае, эл.-тэхн., вытв-сць мед. абсталявання), хім. і нафтахім., паліграф., тэкст., шарсцяная, папяровая, харчовая, у т.л. вытв-сць віскі. Здабыча нафты (на шэльфе Паўн. мора). У сельскай гаспадарцы пераважае жывёлагадоўля. Гадуюць авечак, буйн. раг. жывёлу. Сеюць ячмень, авёс, бульбу. Рыбалоўства. Транспарт марскі, чыг., аўтамабільны.

Найстараж. насельніцтва Ш. — *пікты*. У 5—7 ст. н.э. тут пасяліліся кельцкія плямёны *скотаў* (ад іх і назва краіны Scotland — краіна скотаў), гэлаў, *брытаў* і германскія — *англаў*. З 6 ст. пашыралася хрысціянства. У 844—1018 дзяржава скотаў падпарадкавала сабе ўсе інш. плямёны, утварылася Шатл. каралеўства. Адбываліся працэсы феадалізацыі, але ў горнай Ш. да 18 ст. захоўвалася сістэма родавых абшчын — *кланаў*. З 2-й пал. 11 ст. Ш. — васал Англіі, войскі якой у 1296 уварваліся на яе тэрыторыю. Пад кіраўніцтвам У.*Уолеса* і караля *Роберта Бруса* [1306—29] шатландцы да 1328 аднавілі сваю незалежнасць. У канцы 13 — пач. 14 ст. афармляецца шатл. парламент. У сярэдзіне 16 ст. праведзена кальвінісцкая *Рэфармацыя*, у 1560 парламент зацвердзіў у якасці дзярж. рэлігіі *прэсвітэрыянства*. Зацвярджэнне шатл. каралеўскай дынастыі *Сцюартаў* на англ. прастоле (1603) прывяло да асабістай уніі Ш. з Англіяй. Паводле *англа-шатландскай уніі 1707* утворана адзінае каралеўства Вялікабрытанія з агульным парламентам (72 дэп. ад Ш. ў 2003) пры захаванні ў Ш. ўласных прававой і суд. сістэм, нац. царквы і мясц. органаў самакіравання. Ва ўрадзе Вялікабрытаніі справамі Ш. кіруе дзярж. сакратар па Ш. За незалежнасць Ш. выступае Шатл. нац. партыя (засн. ў 1928). Паводле закона ад 11.9.1997 у маі 1999 адбыліся выбары ў шатл. рэгіянальны заканад. орган з абмежаванымі паўнамоцтвамі, створаны рэгіянальны ўрад.

Возера Лох-Ломанд у **Шатландыі**.

ШАТРАВА́ЛЬНАЯ МАШЫ́НА, машына для ачысткі зярнят пшаніцы і жыта ад пылу, гразі і інш., частковага аддзялення пладовых абалонак, зародка і бародкі, а таксама лушчэння зярнят крупяных культур. Рабочы орган Ш.м. — вярчальны барабан з падоўжнымі ці радыяльнымі палоскамі (бізунамі), што рухаецца ўнутры цыліндрычнага корпуса, прыціскае зярняты да яго ўнутр. паверхні — сталной або з *абразіўных матэрыялаў*. Выкарыстоўваецца ў *мукамольна-крупяной прамысловасці* і *камбікормавай прамысловасці*.

ШАТРО́ВА Алена Мітрафанаўна (31.5.1892, Масква — 15.7.1976), расійская актрыса. Нар. арт. СССР (1968). Скончыла прыватную тэатр. школу (1912). Працавала ў т-ры М.Сінельнікава ў Харкаве. З 1918 (з перапынкамі) вядучая артыстка б. Т-ра Корша, з 1932 у Малым т-ры. Яе выканальніцкае мастацтва адметнае вытанчанасцю, светлай лірыкай, тонкім гумарам: Ліза («Дваранскае гняздо» паводле І.Тургенева), Ганна Андрэеўна («Рэвізор» М.Гогаля), Марфінька («Абрыў» паводле І.Ганчарова), Купавіна, Лідзія («Ваўкі і авечкі», «Шалёныя грошы» А.Астроўскага), Матрона («Улада цемры» Л.Талстога), Ліза, Маша («Горкі цвет», «Касатка» А.М.Талстога), Катарына («Утаймаванне свавольніцы» У.Шэкспіра). Дзярж. прэміі СССР 1948, 1949.

Літ.: Дурылин С.Н., Клинчин А.П. Е.М.Шатрова. М., 1958.

ШАТРО́Ў (сапр. Маршак) Міхаіл Піліпавіч (н. 3.4.1932, Масква), рускі драматург. Скончыў Маскоўскі горны ін-т (1956). Друкуецца з 1952. У публіцыст. п'есах «Шостага ліпеня» (паст. 1964; аднайм. фільм, 1968), «Трыццатае жніўня. Бальшавікі» (1968), «Сінія коні на чырвонай траве» (1979), «Так пераможам!» (паст. 1982; Дзярж. прэмія СССР 1983) спроба адысці ад спрошчана-схематычнай трактоўкі рэв. падзей 1917, адкрыць «новага» Леніна, які ў канцы жыцця асэнсаваў сваю гіст. памылку (п'еса «Далей... далей... далей!», 1988), адмаўленне ад карыкатурнага паказу апанентаў бальшавікоў. Аўтар публіцыстычных артыкулаў, нарысаў, рэцэнзій і інш. П'есы Ш. ставілі т-ры Беларусі: «Імем рэвалюцыі» — Бел. т-р імя Я.Коласа (1960); «Шостага ліпеня» — Дзярж. рус. драм. т-р Беларусі (1966), Бел. т-р імя Я.Коласа (1967); «Дзень цішыні» — Брэсцкі абл. драм. т-р (1966); «Конь Пржавальскага» — рус. драм. т-р, Магілёўскі абл. драм. т-р (абодва 1973); «Дождж ліў як з вядра» — Бел. рэсп. т-р юнага гледача (1974, з А.Хмелікам), «Мае надзеі» — Гродзенскі і Брэсцкі абл. драм. т-ры (абодва 1978); «Сінія коні на чырвонай траве» — рус. драм. т-р (1979), Брэсцкі т-р (пад назвай «Рэвалюцыйны эцюд»), т-р імя Я.Коласа (абодва 1980), «Далей... далей... далей!» — Гродзенскі абл. драм. т-р (1989).

Тв.: Избранное. М., 1982.

ШАТУ́Н, дэталь крывашыпна-паўзуннага механізма (гл. *Крывашыпны механізм*), якая пераўтварае зваротна-паступальны рух поршня або паўзуна машыны ў вярчальны рух крывашыпа *(каленчатага вала)* або наадварот.

ШАТ-ЭЛЬ-АРА́Б, рака ў Іраку і Іране. Даўж. 195 км, пл. бас. больш за 1 млн. км^2. Утвараецца зліццём рэк *Тыгр* і *Еўфрат*, цячэ па Месапатамскай нізіне, упадае ў Персідскі заліў, утварае дэльту. Асн. прыток — р. Карун (злева). Веснавое разводдзе. Сярэдні расход вады каля 1500 м^3/с. Суднаходная, да г. Басра падымаюцца марскія судны. Асн. парты Басра (Ірак), Харэмшэхр, Абадан (Іран).

ШАТЭ́РНІК Аляксандр Сяргеевіч (н. 16.10.1940, г. Іванава, Расія), бел. скульптар. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1967). Працуе ў станковай і манум.-дэкар. скульптуры, жывапісе. Яго творы вызначаюцца дынамічнай пластыкай, зваротам да ўнутр. свету чалавека, які раскрываецца з дапамогай дэкар. элементаў сімвалічнага і алегарычнага характару. Аўтар помнікаў невядомаму салдату ў в. Гарадзішча Мінскага р-на (1975), падпольшчыцам С.Бабаковай і Г.Каралёвай у г. Старыя Дарогі Мінскай вобл. (1984), сав. воінам і партызанам у г.п. Зэльва Гродзенскай вобл. (1985), землякам, што загінулі ў Вял. Айч. вайну ў в. Янавічы Клецкага р-на Мінскай вобл. (1987), Землякам-аднавяскоўцам» у г. Клецк (1990), «Крывічы» ў г. Полацк Віцебскай вобл. (2001); надмагільных помнікаў Я.Драздовічу ў в. Ліпляні Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. (1982, з А.Марачкіным), А.Макаёнку (1983), М.Ткачову (1993), Ф.Янкоўскаму (1995), Г.Каханоўскаму (1997), М.Грыбаву (2000); манум. дэкар. кампазіцыі «Вясна» на праспекце Мацэрава ў Мінску (1982), мемар. дошак, партрэтаў. Сярод станковых кампазіцый: «Мацярынства» (1972), «Максім Багдановіч» (1981, 1986), «Якуб Колас — настаўнік» (1982), «В.Дунін-Марцінкевіч» (1983), «Мікола Гусоўскі», «Крывічы», «Вітаўт», «Хлеб партызанам», «Дрыгавічы» (усе 1984), «Спеў аб Ефрасінні» (1984, 1994), «Полацк — калыска нашай гісторыі» (1985), «Векапомнае (Рагнеда)» (1986), «Кірыла Тураўскі» (1987), «Адлюстраванне» (1989, 1998), «Прысвячэнне Э.Рознеру» (1993), «А.Марачкін» (2000). Аўтар жывапісных твораў: «Золак» (1997), «Жнівень» (1998), «Грамніцы» (1999), «Бэз» (2003) і інш., трыпціха «Венецыя» (2000), серыі пейзажаў «Блакітныя азёры» (1996—97). Іл. гл. да арт. *Скульптура*.

ШАТЭ́РНІК Мікалай Васілевіч (11.9.1890, в. Старына Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл. — 2.12.1934), бел. мовазнавец і педагог. Скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю (1914), Бел. дзярж. вышэйшы пед. ін-т (1934). У 1914—29 настаўнічаў на Міншчыне, у 1933—34 выкладчык бел. мовы і л-ры ў Аршанскім пед. тэхнікуме. Складальнік «Краёвага слоўніка Чэрвеньшчыны» (1929), у якім растлумачыў і праілюстраваў прыкладамі звязнага тэксту значэнне каля 9 тыс. слоў і фразеалагізмаў, сабраных у 35 населеных пунктах б. Ігуменскага павета. Аўтар артыкулаў па пытаннях педагогікі і методыкі.

І.К.Германовіч.

ШАЎРА Рыгор Фёдаравіч (н. 30.8.1944, в. Малы Поўсвіж Лепельскага р-на Віцебскай вобл.), бел. мастацтвазнавец, мастак. Канд. мастацтвазнаўства (1983). Скончыў маст.-графічны ф-т Віцебскага пед. ін-та (1971). З 1977 выкладае ў Бел. ун-це культуры (з 1990 заг. кафедры, з 1997 праф.). Даследуе праблемы развіцця бел. прафес., нар. і самадз. мастацтва. Аўтар даследаванняў творчасці мастакоў Г.Вашчанкі, Л.Дударэнкі, А.Малішэўскага, М.Засінца, Л.Трахалёвай. Працуе ў акварэлі: пейзажы «Над возерам Лепельскім», «Кастрычніцкі мажор», «На Паўночай Дзвіне», «Настальгія» і інш. Дзярж. прэмія Беларусі 2003.

Тв.: Беларускі пейзажны жывапіс. Мн., 1982; Самадзейнае выяўленчае мастацтва Беларусі: Жывапіс, графіка, скульптура. Мн., 1995; Перспектыва ў малюнку і жывапісе. Мн., 1999; Малюнак у навучальным працэсе. Мн., 2003.

Л.Ф.Салавей.

ШАЎКАВО́ДСТВА, галіна сельскай гаспадаркі па развядзенні *шаўкапрадаў* для атрымання шаўкавічных коканаў — сыравіны для вырабу натуральнага *шоўку*. Асн. масу коканаў дае *тутавы шаўкапрад*, менш *дубовы шаўкапрад* і інш. матылі з сям. паўлінавочак. Састаўныя часткі Ш.: вырошчванне *шаўкоўніцы* (корму для вусеняў тутавага шаўкапрада), выкормліванне вусеняў, грэнаж (атрыманне яец ад матылёў) і першасная апрацоўка коканаў.

Ш. вядома ў Кітаі з 3-га тыс. да н.э. Развіта ў Японіі, Кітаі, Індыі, Турцыі, Італіі, Бразіліі, краінах Сярэдняй Азіі.

ШАЎКАГРА́ФІЯ (ад *шоўк* + *...графія*), серыграфія, від маст. *трафарэтнага друку*. Алейныя або вадзяныя фарбы з дапамогай эластычнай пласціны (ракеля) праціскаюцца на паперу праз шаўковую сетку, нацягнутую на раму. Участкі, свабодныя ад малюнка, закрываюць непранікальным для фарбы саставам. Ш. адметная яркасцю і дэкар. маляўнічасцю каларыту, дазваляе атрымліваць рэльефныя выявы. З дапамогай Ш. можна друкаваць якасныя рэпрадукцыі карцін. Тэхніка Ш. з'явілася ў 20 ст. ў творах графікі, была запазычана з кіт. і яп. друку на тканінах. З 1930-х г. пашырылася ў творах Дж.Полака, Р.Раўшэнберга, Б.Шана (ЗША), В.Вазарэлі, Ф.Лежэ (Францыя). На Беларусі вядома з 2-й пал. 20 ст. ў творчасці У.Вішнеўскага, С.Войчанкі, Л.Кальмаевай, Г.Мацура, К.Ракіцкага, Дз.Раманюка, У.Цэслера і інш.

ШАЎКАЛЮ́К Віктар Раманавіч (н. 18.8.1926, г. Анжэра-Суджанск Кемераўскай вобл., Расія), бел. артыст аперэты (лірычны тэнар). Засл. арт. Беларусі (1968). Скончыў студыю пры Ленінградскім т-ры імя Ленінскага камсамола (1947). Працаваў у розных т-рах краіны. З 1962 у Магілёўскім абл. т-ры муз. камедыі, у 1970—90 у Дзярж. т-ры муз. камедыі Беларусі. Камед. акцёр яскравага таленту, творчая палітра якога

вызначалася разнастайнасцю востраха-рактарных вобразаў. Сярод партый у бел. рэпертуары: Трынтрава, Віктор, Пустарэвіч, Даніла, Цар («Рабінавыя каралі», «Пяе «Жаваранак», «Паўлінка», «Тыдзень вечнага кахання», «Сцяпан — вялікі пан» Ю.Семянякі), Мацей («Несцерка» Р.Суруса). З інш. роляў: Боні і князь Валяпюк, Зупан («Сільва», «Марыца» І.Кальмана), барон Зета («Вясёлая ўдава» Ф.Легара), Амедэй і Фальк («Лятучая мыш» І.Штрауса), Яшка-артылерыст («Вяселле ў Малінаўцы» Б.Аляксандрава) і інш. *А.Я.Ракава.*

ШАЎКАПРА́ДЫ, агульная назва шэрагу сям. начных матылёў. Да іх адносяцца: *сапраўдныя шаўкапрады* (найб. вядомы *тутавы шаўкапрад*); бярозавыя Ш., або шаўкакрылы (Endromididae); *ваўнянкі* (*няпарны шаўкапрад, манашка*, Ш. залацісты); жоўтыя, або асеннія, Ш. (Lemoniidae); *коканапрады* (*кольчаты шаўкапрад*, хваёвы); *паўлінавочкі* (*дубовыя шаўкапрады*). Гл. таксама іл. да гэтых арт. *С.Л.Максімава.*

Шаўкапрады: 1 — адуванчыкавы; 2 — бярозавы; 3 — залацісты; 4 — зубчасты.

Шаўкоўніца чорная.

ШАЎКО́ВАЯ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, галіна *тэкстыльнай прамысловасці* па вырабе *шаўковых тканін* з натуральных і сінтэтычных валокнаў (гл. *Шоўк*). Уключае вытв-сці: коканаматальную, шоўкапрадзільную, круцільную, ткацкую, фарбавальна-аддзелачную. Найб. развіта ў Японіі, ЗША, Кітаі, Італіі, Францыі, Вялікабрытаніі, Індыі.

На Беларусі ткацтва шаўковых тканін пачалося ў 18 ст., калі на прыватной сыравіне працавала *Слуцкая мануфактура шаўковых паясоў*. З 1781 дзейнічалі Шклоўская шаўкаткацкая мануфактура, у канцы 19 — пач. 20 ст. — *Альбярцінская шоўкакруцільная фабрыка* і *Лахазвянская шоўкакруцільная фабрыка*. Сучасная Ш.п. створана пасля Вял. Айч. вайны. Найб. буйныя прадпрыемствы Ш.п. (2003): *Віцебскі камбінат шаўковых тканін, Магілёўскае вытворчае аб'яднанне «Хімвалакно»*, *Светлагорскае вытворчае аб'яднанне «Хімвалакно»*; выпуск шаўковых тканін наладжаны на *Магілёўскай стужкаткацкай фабрыцы*, Кобрынскай прадзільна-ткацкай ф-цы, Слонімскай тэкстыльнай ф-цы і інш. Асн. сыравіна (хім. валокны) для Ш.п. вырабляецца на Беларусі. Выпушчана (2001) шаўковых тканін 36 491 тыс. пагонных метраў. Частка прадукцыі экспартуецца. *П.І.Рогач.*

ШАЎКО́ВАЯ ТКАНІ́НА, *тканіна тэкстыльная* з натуральнага *шоўку* ці хім. валокнаў.

Ш.т. адрозніваюцца структурай нітак (кручаныя, тэкстураваныя, комплексныя і інш.), тыпам перапляцення. Вырабляюць Ш.т. адбеленую, афарбаваную, набіўную, меланжавую, муаравую, з ціснennем. Паводле прызначэння падзяляюць на тэхн., электраізаляцыйныя, парашутныя, млынавыя (для сітаў), мэблевыя, сукеначныя, бялізнавыя, гальштучныя і інш. Натуральныя Ш.т. вызначаюцца добрымі гігіенічнымі ўласцівасцямі, мяккасцю, але нястойкія да сонечных прамянёў і выцірання, даюць вял. ўсадку, расцягваюцца. Вытв-сць натуральных Ш.т. складае 2—3% ад агульнага аб'ёму *шаўковай прамысловасці*. Ш.т. з хім. валокнаў устойлівыя да выцірання, лёгкія, трывалыя, не камячацца, але маюць нізкую гіграскапічнасць. *А.А.Калмыкова.*

ШАЎКО́Ў Віктар Анатолевіч (н. 2.2.1955, Мінск), бел. спартсмен (скораснае падводнае плаванне). Майстар спорту СССР міжнар. класа (1982). Чэмпіён свету ў падводным плаванні (1980, г. Балоння, Італія) на дыстанцыі 800 м і сярэбраны прызёр на дыстанцыі 400 м. Чэмпіён СССР у падводным плаванні на дыстанцыі 800 м (1980—81).

ШАЎКО́ЎНІК, вадзяны казялец (Batrachium), род кветкавых раслін сям. казяльцовых. Больш за 30 відаў. Пашыраны ва ўмераных паясах. На Беларусі 7 відаў. Найб. вядомы Ш. цвердалісты (B. circinatum). Трапляюцца ў стаячых або з павольнай плынню водах, прыбярэжнай зоне вадаёмаў.

Адна- і шматгадовыя водныя травяністыя расліны. Лісце чаргаванае, надводнае — лопасцевае ці рассечанае, падводнае — моцна рассечанае на ніткападобныя долі. Кветкі белыя, адзіночныя, на доўгіх кветаносах. Плод — шматарэшак. Корм для водных жывёл і вадаплаўных птушак. *Дз.І.Трацякоў.*

А.Л.Шаўлаў.

ШАЎКО́ЎНІЦА, тут, тутавае дрэва (Morus), род кветкавых раслін сям. тутавых. Больш за 20 відаў. Пашыраны ў цёплаўмеранай зоне Азіі, часткова ў Амерыцы і Афрыцы. У Кітаі культывуюць Ш. белую (M. alba) больш за 2,5 тыс. гадоў. Існуе каля 400 сартоў і форм. На Беларусі інтрадукавана Ш. белая і чорная (M. nigra).

Лістападныя дрэвы выш. 16—35 м, жывуць да 200 гадоў. Крона густая, шатрападобная. Лісце на маладых парастках суцэльнае, потым — лопасцевае, зубчастае. Дробныя кветкі раздзельнаполыя, сабраны ў каташкападобныя суквецці, паяўляюцца разам з лісцем. Плод — несапраўдная сакаўная касцянка ў суплоддзі, белая, чырв. або чорная, ядомая. Мае да 22% цукроў (пераважна фруктоза і глюкоза). Спажываецца ў свежым і перапрацаваным выглядзе. Лісце Ш. белай — асн. корм лічынак тутавага шаўкапрада, з коканаў якога атрымліваюць натуральную шаўковую пражу. Драўніна выкарыстоўваецца ў буд-ве. Харч., тэхн., дэкар. расліны. *Дз.І.Трацякоў.*

ШАЎКУНЁНКА Аляксей Аляксеевіч (21.3.1884, г. Херсон, Украіна — 12.3.1974), украінскі жывапісец. Нар. маст. СССР (1944). Правадз. чл. АМ СССР (1947). Скончыў Адэскае маст. вучылішча (1908), Пецярб. АМ (1917). З 1926 выкладаў у адэскіх політэхнікуме выяўл. мастацтваў, маст. ін-це (з 1935 праф.), у 1936—65 праф. Кіеўскага маст. ін-та. Пісаў псіхал. партрэты: В.Забалотнага (1942), Б.І.Якаўлева (1944), С.А.Каўпака (1945), М.Рыльскага (1944—45), М.Літвіненка-Вольгемут (1947), Ф.І.Трушына (1949), індустр. пейзажы: серыі акварэлей «Адэскі суднабудаўнічы завод» (1929—30), «Днепрабуд» (1930—32), «Луганскі паравозабудаўнічы завод» (1936). Значнае месца ў творчасці належыць пейзажам Украіны, Малдавіі, Кабардзіна-Балкарыі, Башкірыі. Дзяж. прэмія Украіны імя Т.Шаўчэнкі 1970.

Літ.: Владич Л. Алексей Шовкуненко. М., 1983.

ШАЎЛАЎ (Schawlow) Артур Леанард (5.5.1921, г. Маўнт-Вернан, ЗША — 28.4.1999), амерыканскі фізік, адзін з вынаходнікаў *лазера* і заснавальнікаў *лазернай спектраскапіі*. Чл. Нац. АН

ЗША (1970), Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1970). Скончыў Ун-т Таронта (1942), дзе і працаваў. З 1949 у Калумбійскім ун-це, з 1951 у фірме «Бел тэлефон лабаратарыс», з 1961 праф. Стэнфардскага ун-та. Навук. працы па звышправаднасці, ядз. квадрупольным рэзанансе, аптычнай, мікрахвалевай і лазернай спектраскапіі, квантавай электроніцы. Абгрунтаваў (1958) і запатэнтаваў (1960) прынцып работы лазера (з Ч.Х.*Таўнсам*). Упершыню эксперыментальна назіраў вузкія двухфатонныя рэзанансы (1974; незалежна ад Н.*Бломбергена*, гл. Дадатак). Першы выказаў ідэю лазернага ахаладжэння нейтральных атамаў да звышнізкіх тэмператур (1975; з Т.Хэншам). Развіў шэраг метадаў лазернай спектраскапіі звышвысокага распазнавання. Нобелеўская прэмія 1981 (з Бломбергенам і К.М.*Сігбанам*). Нац. навук. медаль ЗША (1991). Яго імем названа малая планета.

Тв.: Рус. пер. — Радиоспектроскопия. М., 1959 (разам з Ч.Таўнсам); Оптические квантовые генераторы (лазеры). М., 1962 (разам з С.Фогелем, Л.Далберджэрам); Спектроскопия в новом свете // Успехи физ. наук. 1982. Т. 138, вып. 2.

М.М.Касцюковіч.

ШАЎЛО́ЎСКАЯ Марыя Фёдараўна (н. 14.2.1941, в. Выдранка Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. літаратуразнавец, крытык. Канд. філал. н. (1972). Скончыла Мінскі пед. ін-т (1962). Настаўнічала, з 1964 у Бел. пед. ун-це (з 1995 заг. кафедры). Даследуе праблемы сучаснай бел. драматургіі, дзіцячай л-ры і фальклору. Аўтар кн. «Беларуская драматургія» (1981), сааўтар «Гісторыі беларускай літаратуры» (2-е выд., т. 1—3, 1996—2000), падручнікаў «Роднае слова» для 1-га (1998) і 2-га класаў (1999, абодва з В.Віткам), для 3-га класа (2001, з М.Мішчанчуком), складальнік хрэстаматый «Уводзіны ў літаратуразнаўства» (2-е выд. 1991, з Мішчанчуком), «Беларуская дзіцячая літаратура» (2003) і інш.

ШАЎЛЯ́Й, горад у Літве. Вядомы з 1236, з 1569 горад. Да 1795 наз. Саўле, да 1917 Шаўлі. 146,2 тыс. ж. (2001). Чыг. вузел. Прам-сць: машынабудаванне (тэлевізары, станкі і інш.), лёгкая (трыкат., скургалантарэйная, абуткавая), харч.; вытв-сць буд. матэрыялаў, мэблі. Пед. ін-т. Тэатр. Гіст.-этнагр. музей. Помнік архітэктуры — касцёл Пятра і Паўла (1595—1625).

ШАЎЛЯЙСКАЯ АПЕРА́ЦЫЯ 1944, наступальная аперацыя войск 1-га Прыбалтыйскага фронту (ген. арміі І.Х.*Баграмян*) 5—31.7.1944; састаўная частка *Беларускай аперацыі 1944*. Мэта — выйсці да Рыжскага заліва і адрэзаць шляхі адыходу войскам ням. групы армій «Поўнач» ва Усх. Прусію. Удзельнічалі 2-я і 6-я гвардзейскія, 43-я і 51-я арміі. Пачалася пасля завяршэння 4 ліп. *Полацкай аперацыі 1944*. Войскі 6-й арміі 6 ліп. вызвалілі г. Браслаў, 8 ліп. — г.п. Відзы, 9-га ліп. — г.п. Лынтупы і перарэзалі чыг. Даўгаўпілс—Вільнюс. У працяг наступлення на гэтым напрамку 20 ліп. войскі 2-й і 51-й армій пры падтрымцы 39-й арміі (са складу 3-га Бел. фронту) занялі гарады Паневяжыс, Шаўляй, Даўгаўпілс. Пасля 27 ліп. войскі 1-га прыбалт. фронту разгарнулі наступленне на тэр. Літвы і Латвіі, да 31 ліп. вызвалілі г. Елгава і выйшлі да Рыжскага заліва, адрэзаўшы групу армій «Поўнач» ад Усх. Прусіі.

ШАЎЛЯКО́Ў Віталь Васілевіч (н. 28.1.1947, станіца Чамлінская Краснадарскага краю, Расія), бел. вучоны ў галіне медыцыны працы, экалагічнай імуналогіі і алергалогіі. Д-р мед. н. (1999). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1971). З 1971 у Бел. санітарна-гігіенічным НДІ (з 1986 заг. лабараторыі). Навук. працы па вывучэнні асаблівасцей працы пры ўздзеянні алерганебяспечных і спалучаных фактараў, імунатаксічных і алергенных уласцівасцей прамысл. рэчаў.

Тв.: Подходы к гигиенической оценке аллергоопасности условий труда (разам з Г.І.Эрм) // Медицина труда и промышлен. экология. 2000. № 12; Характер и механизмы комбинированного действия химических аллергенов // Предпатология: пробл. и решения: Сб. науч. тр. Мн., 2000; Состояние и перспективы иммунологических и аллергологических исследований в гигиене // Здоровье и окружающая среда: Сб. науч. тр. Барановичи, 2002. Т. 2.

ШАЎМЯ́Н Сцяпан Георгіевіч (13.10.1878, Тбілісі — 20.9.1918), палітычны дзеяч. Скончыў Берлінскі ун-т (1905). Чл. РСДРП з 1900, яе ЦК з 1912. У 1917 старшыня Бакінскага савета, з крас. 1918 — Бакінскага СНК. Адначасова са снеж. 1917 надзвычайны камісар РСФСР па справах Каўказа. Расстраляны ў ліку 26 *бакінскіх камісараў*. Аўтар прац па пытаннях філасофіі, мастацтва і л-ры. У яго гонар названы гарады Сцепанаван (Арменія) і *Сцепанакерт* (Азербайджан).

ШАЎНЯ́ Анатоль Аляксандравіч (н. 2.9.1930, г.п. Дорахава Рузскага р-на Маскоўскай вобл.), бел. паэт, перакладчык. Скончыў 1-ы Маскоўскі пед. ін-т замежных моў (1954). З 1954 працаваў у газ. «Советская Белоруссия», з 1959 у час. «Беларусь», у 1981—90 на кінастудыі «Беларусьфільм». Друкуецца з 1952. У паэт. зб-ках «Паводка» (1975), «Урок дабрыні» (1980) роздум над лёсам сучасніка, тэмы дружбы, кахання. На бел. мову пераклаў аповесці «Праўдзівая гісторыя» Л.Стурані (1957), «Прыгоды К'ядзіна» М.Арджылі і Г.Паркі (1959), «Юнацтва становіцца ў строй» В.Берціні (1960), раман «Лішнія» Д.Арфелі (1965), зб. апавяданняў «Золата Фарчэлы» (1968); «Казкі нашых дзён» Арджылі (1971) і інш. Укладальнік і адзін з перакладчыкаў кароткай анталогіі італьян. паэзіі «Ад вежаў Ферары» (1974). Аўтар сцэнарыя дакумент. фільма «Кандрат Крапіва» (1983) і інш. Выступае як публіцыст, крытык і эсэіст па пытаннях тэатр., выяўл., муз. мастацтва.

І.Я.Шаўроў.

ШАЎРО́Н (франц. chevron), нашыўкі розняй формы з галуну, тасьмы або шнура на розных частках абмундзіравання вайсковага (часцей на левым рукаве); адзін са *знакаў адрознення* ў многіх арміях свету, у т.л. Рэспублікі Беларусь. Выкарыстоўваецца таксама для абазначэння колькасці гадоў службы, навучання курсантаў у ваен. навучальных установах, раненняў і інш.

ШАЎРО́Ў Іван Ягоравіч (27.3.1916, в. Шабуні Віцебскага р-на — 25.4.1992), савецкі военачальнік. Ген. арміі (1973). Праф. (1977). Скончыў бранятанкавае вучылішча (1938), Ваен. акадэмію механізацыі і матарызацыі Чырв. Арміі (1941), Акадэмію Генштаба (1948); Вышэйшыя акад. курсы пры ёй (1968). У Чырв. Арміі з 1935. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Бранскім, Паўд.-Зах., Паўд., Данскім, Цэнтр., 4-м Укр., 1-м і 2-м Прыбалт. франтах: нач. штаба танк. батальёна, нам. нач. і нач. штаба танк.

брыгады (1941—43), нач. аператыўнага аддзела штаба ўпраўлення камандуючага бранятанк. і механіз. войскамі фронту, нач. аператыўнага аддзела штаба танк. арміі, нач. штаба танк. корпуса. Удзельнік Сталінградскай і Курскай бітваў, вызвалення Крыма, баёў у Прыбалтыцы. У 1957—60 нам. галоўнакамандуючага Групай сав. войск у Германіі, у 1963—67 нам. камандуючага, камандуючы ваен. акругамі. У 1973—78 нач. Ваен. акадэміі Генштаба, з 1978 у апараце галоўнакамандуючага Аб'яднанымі ўзбр. сіламі дзяржаў — удзельніц Варшаўскага дагавора. Чл. ЦК КПСС у 1971—76. Дэп. Вярх. Савета СССР у 1970—74.

ШАЎЦО́ВА Марыя Мітрафанаўна (н. 2.2.1928, ст. Заварычы Браварскага р-на Кіеўскай вобл.), бел. мастак дэкар.-прыкладнога мастацтва. Скончыла Львоўскі ін-т прыкладнога і дэкар. мастацтва (1953). З 1961 гал. мастак Рэсп. ўпраўлення маст. прам-сці, у 1966—87 ін-та Белмясцпраект. Сярод твораў вазы «Несцерка» (1968), «Лявоніха» (1987); серыі ваз «Ікебана» (1970), талерак «Па матывах беларускага Палесся», «Блакіт-

М.**Шаўцова**. Набор для квасу. 1982.

ныя азёры» (абедзве 1972), «Мінску — гораду-герою прысвячаецца» (1973), дэкар. пластоў «Беларускім народным майстрам прысвячаецца» (1975—80), «Івянецкія майстры» (1980), «Кампазітар С.Манюшка», «Ф.Скарына» (1981), «Гісторыя Мінска» (1999—2000), наборы для квасу (1982) і талерак «Зямля беларуская» (1985), «Тайны лясныя» (1986) і інш. Распрацавала для масавай вытв-сці камплекты керамічнага посуду. Творы вылучаюцца мяккасцю, рытмічнай гульнёй форм і ліній, эмацыянальнасцю. *Л.Ф.Салавей.*

ШАЎЦО́Ў Юрый Анатолевіч (н. 16.12.1959, Мінск), бел. спартсмен і трэнер (гандбол). Засл. майстар спорту СССР (1988). Скончыў Бел. ін-т фіз. культуры. Чэмпіён XXIV Алімп. гульняў (1988, Сеул). Чэмпіён свету (1982), СССР (1981, 1984, 1985, 1986, 1988, 1989). Уладальнік Кубка еўрап. чэмпіёнаў (1987, 1988, 1989, 1990), Кубка кубкаў (1983, 1988), Суперкубка (1989). Гуляў у складзе каманды СКА (Мінск, 1978—90), з 1991 у Германіі. У 1990—91 трэнер юнацкай зборнай каманды Беларусі па гандболе. З 1992 на трэнерскай рабоце ў клубах Германіі [у якасці трэнера чэмпіён Германіі (1997), сярэбраны прызёр Кубка Германіі]. *А.М.Петрыкаў.*

«ШАЎЦЫ́», «Ш а в е ц», бел. нар. мужчынскі танец. Муз. памер 2/4. Тэмп умераны. У танцы выразнымі рухамі перадаюцца працэсы працы шаўца: намотванне на руку і васкаванне дратвы, шыццё абутку, падбіўка падэшвы цвікамі і інш., а потым выхваленне абуткам. У пач. 20 ст. быў вядомы сольны варыянт танца «Чобаты», яго выконваў І.Буйніцкі ў выступленнях сваёй трупы. Існуе варыянт і для мяшанага складу выканаўцаў. Зафіксаваны ва ўсх. і зах. раёнах Беларусі. Падобны танец ёсць у Літве і на Украіне. *Л.К.Алексютовіч.*

ШАЎЧО́НАК Марыя Сіланцьеўна (н. 11.5.1944, в. Новы Востраў Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. паэтэса. Скончыла БДУ (1965). З 1965 настаўнічала, працавала ў Шчучынскай раённай газеце, з 1978 на Гродзенскай абл. студыі тэлебачання, у выд-ве Ін-та сучасных ведаў, на радыё «Гродна». З 2001 гал. рэдактар альманаха «Нябесны знак». Друкуецца з 1954. У паэт. зб-ках «Белая ластаўка» (1971), «Свята зямлі» (1976), «Бацькоўскае імя» (1981), «Раса-расінка» (1985) і інш. роздум пра жыццё і каханне, пераемнасць пакаленняў, паэтызацыя прыроды. Некат. вершы Ш. пакладзены на музыку.

ШАЎЧУ́К Іван Іванавіч (30.1.1887, г. Пінск Брэсцкай вобл. — 10.3.1965), бел. селекцыянер, паслядоўнік І.У.*Мічурына*. Скончыў Пінскае рэальнае вучылішча (1905). З 1948 заг. Пінскага пункта па культуры вінограду Бел. пладова-агародніннай доследнай станцыі. Вывучыў больш за 150 сартоў вінограду, з якіх некат. рэкамендаваў для вырошчвання ў паўд. садовай зоне Беларусі. Распрацаваў тэхналогію і даказаў магчымасць вырошчвання вінограду на Беларусі. Вывеў сорт абрыкоса Пурпуровы.

ШАЎЧЭ́НКА, сям'я ўкраінскіх артыстаў цырка (дрэсіроўшчыкі). Нар. арт. СССР (1988). У л а д з і м і р Д з м і т р ы е в і ч (н. 31.7.1947, г. Омск, Расія). Нар. арт. Украіны (1979). Скончыў Дзярж. вучылішча цыркавога і эстр. мастацтва ў Маскве (1966). Л ю д м і л а А л я к с е е ў н а (н. 13.7.1945, г. Канаш, Чувашыя). Скончыла Дзярж. вучылішча цыркавога і эстр. мастацтва ў Маскве (1967). Сумесна падрыхтавалі атракцыён «Дрэсіраваныя львы і тыгры», у якім аб'яднаны прыёмы дрэсіроўкі жывёл з паветрана-гімнастычнымі і акрабатычнымі трукамі артыстаў.

ШАЎЧЭ́НКА Акім Міхайлавіч (28.11.1902, в. Карма Добрушскага р-на Гомельскай вобл. — 12.12.1980), бел. жывапісец. Вучыўся ў Вышэйшых маст.-тэхн. майстэрнях у Маскве (1927—30), скончыў Ленінградскі ін-т пралет. выяўл. мастацтва (1931). З 1933 выкладаў на курсах выяўл. мастацтва клубных інструктараў, у 1936—41 кіраваў студыяй пры абл. Доме нар. творчасці ў Гомелі, у 1947—50 выкладаў у Мінскім маст. вучылішчы. Яго творчасці ўласцівы глыбокае пранікненне ў характары і сітуацыі, строгая яснасць і завершанасць твораў: «Плытагоны» (1932), «На торфараспрацоўках» (1935), «Лес — будоўлям» (1952), «Янка Купала на жытнёвым полі» (1954), «Тынкоўшчыцы» (1957), «У саўгасе «Брылёва» (1959), «Наша песня роднаму краю», «Я.Купала і Я.Колас па дарозе ў Канеў» (абодва 1967), «У дзень Перамогі» (1968), «Аб гераічным мінулым» (1976). Пісаў таксама партрэты (пісьменніка У.Карпава, 1973), пейзажы, нацюрморты. *Л.Ф.Салавей.*

А.**Шаўчэнка**. Партрэт пісьменніка У.Карпава. 1973.

ШАЎЧЭ́НКА Васіль Савельевіч (н. 20.1.1935, с. Цыбулева Знаменскага р-на Кіраваградскай вобл., Украіна), бел. вучоны ў галіне машыназнаўства. Д-р тэхн. н. (1986), праф. (1991). Скончыў Харкаўскі авіяц. ін-т (1958). З 1960 у ін-це механікі і надзейнасці машын Нац.

АН Беларусі (з 1966 заг. лабараторыі). Навук. працы па прагназіраванні і забеспячэнні надзейнасці прыводаў машын. Распрацаваў метады структурнага і эксплуатацыйнага забеспячэння надзейнасці асн. тыпаў прыводаў машын і складаных тэхн. сістэм. Дзярж. прэмія Беларусі 1978.

Тв.: Введение в оптимальное проектирование машин. Мн., 1974; Гидропневмоавтоматика и гидропривод мобильных машин: Эксплуатация и надежность гидро- и пневмосистем. Мн., 2001 (разам з М.У.Богданам, П.Н.Кішкевічам).

ШАЎЧЭ́НКА Тарас Рыгоравіч (9.3.1814, в. Морынцы Звянігародскага р-на Чаркаскай вобл., Украіна — 10.3.1861), ук-

Т.Р.Шаўчэнка.

раінскі пісьменнік, мастак, рэвалюцыянер-дэмакрат; заснавальнік новай укр. л-ры і нац. літ. мовы. Вучыўся ў Пецярб. АМ у К.*Брулова* (1838—45). Як дваровы П.В.Энгельгарта жыў у Вільні (1829—31), потым у Пецярбургу. У 1838 з дапамогай Брулова, В.Жукоўскага і інш. выкуплены з прыгону. З 1845 працаваў у Кіеўскай археаграфічнай камісіі. За ўдзел у тайным *Кірыла-Мяфодзіеўскім таварыстве* арыштаваны і аддадзены ў салдаты (1847—57). Пасля ссылкі (з 1858) жыў у Пецярбургу. Прыхільнік рэв. шляху ліквідацыі прыгоннiцтва, яднання слав. народаў у барацьбе за сац. і нац. вызваленне. Пісаць пачаў каля 1836—37. Выдаў зб. «Кабзар» (1840). Творы Ш. прасякнуты любоўю да радзімы, напісаны нар. мовай, вызначаюцца блізкасцю да фальклору, разнастайнасцю рытмаў, меладычнасцю. У ранняй яго творчасці (вершы, балады, паэмы «Кацярына», 1838, «Гайдамакі», 1841; драма «Назар Стадоля», 1843, і інш.) спалучэнне рамантызму з рэаліст. тэндэнцыямі. У паэме «Наймічка» (1845) стварыў яркі драм. вобраз жанчыны-маці. У паэмах «Сон» (1844), «Каўказ», «Ератык» (абедзве 1845), «Неафіты» (1857), цыклах «У каземаце» (1847), «Цары» (1848), паэзіі перыяду ссылкі, аповесцях «Княгіня» (1853), «Музыка» (1855) і інш. рэв. і антыпрыгонніцкія матывы. Аўтар паэм «Сляпая» (1842), «Князёўна» (1847), «Марына» (1848), «Юродзівы» (1857), «Марыя» (1859), балады «Сурочаная» (1837), трыпціха «Доля», «Муза», «Слава» (1858), аповесцей «Варнак» (1845), «Няшчасны», «Капітанша», «Блізняты» (усе 1855), «Мастак» (1856), «Прагулка з задавальненнем і не без маралі» (1856—58). Многія вершы Ш. сталі нар. песнямі.

Ш. — заснавальнік рэаліст. кірунку ва ўкр. выяўл. мастацтве. Майстар партрэта, гіст. і жанравых кампазіцый, ілюстрацый, натурных замалёвак, афортаў («Аўтапартрэт», 1840—41; «Кацярына», 1842; серыя афортаў «Жывапісная Украіна», выд. 1844, і інш.). За працы ў галіне гравюры атрымаў званне акадэміка (1860). Яго маст. спадчына прасякнута народнасцю, сац. накіраванасцю, гуманіст. пафасам. У 1969 установлена Дзярж. прэмія Украіны імя Ш.

З Беларуссю Ш. ўпершыню пазнаёміўся ў час паездкі ў ліку дваровых з Украіны ў Вільню (1829); ён праязджаў праз Беларусь з Пецярбурга на Украіну ў 1843, потым з Кіева ў Пецярбург у 1847. Быў знаёмы з польскім і бел. мастаком Б.Залескім, літаратарамі Я.Баршчэўскім, Р.Друцкім-Падбярэскім, скульптарам М.Мікешыным. Цікавіўся бел. л-рай і фальклорам, успамінаў пра Беларусь у сваім «Дзённіку» (нап. 1857—58). Пра жыццё прыгонных беларусаў пісаў у аповесці «Музыка». Многія творы Ш. ўвайшлі ў бел. фальклор, сталі нар. песнямі. Яго паэзія паўплывала на творчасць Ф.Багушэвіча, А.Гурыновіча, Я.Лучыны і інш. Сувязям Ш. з Беларуссю прысвечаны арт. «Тарас Шаўчэнка і беларусы» Р.Зямкевіча (1911). Паэтыку Ш. даследаваў М.Багдановіч (арт. «Памяці Т.Р.Шаўчэнкі», «Краса і сіла: Спроба даследавання верша Т.Р.Шаўчэнкі», абодва 1914), перакладаў яго вершы на рус. мову. Ш. прысвяцілі свае творы бел. паэты (зб. «У вянок Т.Р.Шаўчэнку», 1939). Творчасць Ш. даследавалі і даследуюць С.Александровіч, В.Івашын, А.Мальдзіс, Э.Мартынава. На бел. мову яго творы пераклалі М.Аўрамчык, Р.Барадулін, П.Броўка, З.Бядуля, Н.Гілевіч, П.Глебка, С.Грахоўскі, С.Законнікаў, В.Зуёнак, М.Клімковіч, Я.Колас, К.Крапіва, А.Куляшоў, Я.Купала, Н.Мацяш, Я.Сіпакоў, Х.Чарнышэвіч.

Тв.: Повне зібрання творів. Т. 1—6. Київ, 1963—64; Бел. пер. — Наймічка. Мн., 1940; Выбраныя вершы і паэмы. Мн., 1948; Кабзар. 2 выд. Мн., 1952; Кацярына. Мн., 1964; Вершы. Паэмы. Мн., 1989; Рус. пер. — Соч. Т. 1—4. М., 1977.

Літ.: Ткаченко М.М. Літопис життя і творчості Т.Г.Шевченка. Київ, 1961; Касіян В.І. Мистецтво Тараса Шевченка. Київ, 1963; Ивакин Ю.А. Сатира Шевченко: Пер. с укр. М., 1964; Кирилюк Е.П., Шабліовський Е.С., Шубравський В.Е. Т.Г.Шевченко: Біогр. Київ,1964; Шагинян М.С. Тарас Шевченко. М., 1964; Шубравський В.Е. Шевченко і літератури народів СРСР. Київ, 1964; Шевченківський словник. Т. 1—2. Київ, 1978; Спогади про Тараса Шевченка. Київ, 1982; Багдановіч М. Збор твораў. Мн., 1968. Т. 2. С. 139—157; Тарас Шаўчэнка і беларуская літаратура. Мн.,1964; Чайківський Б. Незабутна сторінка дружби: (Т.Г.Шевченко і біл. літ.). 2 вид. Київ, 1971.

К.Р.Хромчанка.

ША́ФАР, пасада ў ВКЛ, скарбовы ўраднік. Павятовага Ш. выбірала шляхта павета. Адказваў за раскладку і збор дзярж. падаткаў. Забіраў у зборшчыкаў падаткаў (паборцаў) сабраныя грошы і адвозіў іх у дзярж. скарб у Вільню. Пры адсутнасці ў павеце паборцаў выконваў іх функцыі. У прыватных маёнтках Ш. выконвалі функцыі бухгалтараў, аканомаў.

ША́ФАРЫК, Шафаржык (Šafařík) Павел Іозеф (13.5.1795, в. Кабельярове, Славакія — 26.6.1861), чэшскі і славацкі філолаг, гісторык, паэт; дзеяч чэш. і славацкага нац.-вызв. руху. Скончыў Іенскі ун-т (1817). Працаваў у гімназіі ў г. Нові-Сад (1819—33), з 1848 дырэктар б-кі Пражскага ун-та. Адзін з лідэраў *Пражскага паўстання 1848*. Выступіў як паэт (зб. «Татранская Муза са славянскай лірай», 1814). Даследаваў слав. мовы і культуры, абгрунтаваў іх агульнасць: працы «Гісторыя славянскай мовы і літаратуры на ўсіх дыялектах» (1826), «Аб паходжанні славян» (1828), «Славянскія старажытнасці» (1837), «Славянская этнаграфія» (1842); пытанні гісторыі чэш., славацкай, сербскай моў, паходжанне пісьма ў славян («Пачаткі старачэшскай граматыкі», 1841; «Помнікі старадаўняга пісьменства ў паўднёвых славян», 1851; «Аб паходжанні і радзіме глаголіцы», 1858, і інш.). Распрацоўваў пытанні тэорыі вершаскладання (трактат «Пачаткі чэшскай паэтыкі, у прыватнасці прасодыі», 1818, з Ф.*Палацкім*). Яго працы — першыя ў сусв. гістарыяграфіі грунтоўныя даследаванні па слав. этнагенезе; паўплывалі на развіццё славяназнаўства ў інш. краінах.

Літ.: Мыльников А.С. Павел Шафарик — выдающийся ученый-славист. М.; Л., 1963.

ША́ФЕР (Szafer) Уладзіслаў (23.7.1886, г. Сасновец, Польшча — 16.11.1970), польскі батанік; заснавальнік навук. школы па палеабатаніцы. Чл. Польскай АН (1952, яе віцэ-прэзідэнт у 1957—61). Вучыўся ў Венскім і Львоўскім ун-тах. Праф. Кракаўскага ун-та і дырэктар Бат. сада (з 1917). Арганізатар і дырэктар Ін-та батанікі (1951—63) і Ін-та аховы прыроды (1951—60) Польскай АН. Навук. працы па сістэматыцы і экалогіі сасудзістых раслін, бат. геаграфіі, палеабатаніцы, ахове прыроды. Арганізатар і рэдактар прац: «Флора Польшчы» (т. 1—9, 1919—60), «Расліннае покрыва Польшчы» (т. 1—2, 1959), «Ахова прыроды і яе рэсурсаў» (т. 1—2, 1965). Аўтар «Успамінаў прыродазнаўцы» (1973). Дзярж. прэмія Польшчы 1949.

ША́ФЕР, ША́ФЕРКА, традыцыйныя вясельныя чыны; тое, што *дружкі*.

ШАФРА́Н, крокус (Crocus), род кветкавых раслін сям. касачовых. Каля 80 відаў. Пашыраны ў Еўропе, Міжземнамор'і і Азіі. Культывуецца Ш. пасяўны (C. sativus). На Беларусі інтрадукавана каля 20 відаў і 60 сартоў. Найб. вядомыя Ш.: банацкі (C. banaticus), вясенні (C. vernus), залацістакветкавы (C. chrysanthus) і інш.

Шматгадовыя клубнецыбульныя расліны выш. 5—18 см. Сцябло не развіваецца. Лісце прыкаранёвае, лінейнае, з белай палоскай, паяўляецца ў перыяд цвіцення або пасля яго. Кветкі белыя, ліловыя, пурпуровыя, жоўтыя, правільныя, адзіночныя (зрэдку 2—3). Калякветнік з доўгай трубкай (больш за 10 см), што выносіць кветку над паверхняй глебы, завязь застаецца пад зямлёй. Цвітуць ранняй вяс-

ной, некат. — восенню. Плод — каробачка. Высушаныя рыльцы Ш. пасяўнога пад назвай «шафран» спажываюць як прыправу, фарбу з іх выкарыстоўваюць у кандытарскай і харч. прам-сці. Харч., тэхн., дэкар. расліны.

Дз.І.Траццякоў.

ШАФРА́Н Данііл Барысавіч (13.1.1923, С.-Пецярбург — 1997), расійскі віяланчэліст. Нар. арт. СССР (1977). Ганаровы чл. Міжнар. акадэміі артыстаў у Рыме (1959). Скончыў Ленінградскую кансерваторыю (1950). З 1943 саліст Маскоўскай філармоніі. Яго выкананню былі ўласцівы вытанчанасць, рамант. ўзнёсласць, лірычная адухоўленасць, прыгажосць і пявучасць гуку. Першы выканаўца шматлікіх твораў рас. кампазітараў для віяланчэлі, шэраг з іх прысвечаны яму. Лаўрэат усесаюзных конкурсаў скрыпачоў і віяланчэлістаў (1-я прэмія; Масква, 1937), Міжнар. віяланчэлістаў імя Г.Вігана (1-я прэмія; Прага, 1950). Дзярж. прэмія СССР 1952.

Літ.: Ивашкин А. Д.Шафран. М., 1980.

Шафран Гейфеля.

ШАФРА́НАВА Тамара Аляксандраўна (н. 21.2.1946, г. Віцебск), бел. выканаўца на балалайцы, дырыжор, педагог. Засл. арт. Беларусі (1975). Скончыла Бел. кансерваторыю (1971, кл. М.Прашко). У 1971—2002 выкладчык, адначасова з 1990 кіраўнік і салістка актэта балалаек, кіраўнік і дырыжор аркестра рус. нар. інструментаў муз. вучылішча ў Віцебску. Выканаўчай манеры Ш. уласцівы тонкае адчуванне стылістыкі твора, багатая палітра дынамічных адценняў, эмацыянальная выразнасць муз. вобразаў. У яе рэпертуары апрацоўкі бел. і рус. нар. песень, творы бел. кампазітараў, рус. і замежнай класікі. Лаўрэат Рэсп. і Усесаюзнага конкурсаў артыстаў эстрады (1974), рэсп. конкурсаў хар. і арк. калектываў (1977, 1981, 1984).

А.В.Скорабагатчанка.

ШАФРА́НСКІ Якаў Міхайлавіч (н. 12.3.1950, г. Віцебск), бел. матэматык. Канд. фіз.-матэм. н. (1981). Скончыў БДУ (1972). З 1972 у Ін-це тэхн. кібернетыкі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па дыскрэтнай аптымізацыі і тэорыі раскладаў. Распрацаваў метады рашэння экстрэмальных камбінаторных задач, мадэлі выбару аптымальных параметраў у тэхн. і эканам. сістэмах. Дзярж. прэмія Беларусі 1998.

Тв.: Теория расписаний: Одностадийные системы. М., 1984 (разам з В.С.Танаевым, В.С.Гардонам); Теория расписаний: Групповые технологии. Мн., 1998 (разам з В.С.Танаевым, М.Я.Кавалёвым).

М.П.Савік.

ШАХ (перс.), 1) тытул манарха ў некат. краінах Блізкага і Сярэдняга Усходу і ў Індыі (у Дэлійскім султанаце). Вядомы з часоў *Сасанідаў*, найб. быў пашыраны ў Іране (шахіншах). 2) Становішча ў шахматнай гульні, калі кароль знаходзіцца пад непасрэдным ударам якой-н. фігуры або пешкі праціўніка.

ШАХ Соф'я Мікалаеўна (н. 29.11.1947, в. Лясец Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. паэтэса. Скончыла Мазырскі (1970) і Мінскі (1980) пед. ін-ты. Настаўнічае. Друкуецца з 1972. У паэт. зб-ках «І не пакіне спадзяванне» (1989), «Пад высокай лагодай нябёс» (1995) роздум пра жыццё і яго сэнс, жаночая доля, шчасце кахання. Аўтар кніг вянкоў вянкоў санетаў «Адухаўленне» (2000), «Прысвячэнне» (2001), «Прызначэнне» (2002), зб. вянкоў санетаў «На ўсё дабро ў адказ» (2003). Піша для дзяцей.

Тв.: На скрыжаванні спеўных дзён // Лагодны промень раніцы. Мн., 1988.

ШАХАВЕ́Ц Уладзімір Міхайлавіч (26.11.1918, в. Кімія Барысаўскага р-на Мінскай вобл. — 8.6.1991), бел. пісьменнік. Засл. работнік культ. Беларусі (1979). Скончыў БДУ (1946). З 1946 у рэдакцыі газ. «Літаратура і мастацтва», час. «Полымя», з 1948 у выд-ве «Беларусь», у 1972—82 нам. гал. рэдактара, заг. рэдакцыі выд-ва «Мастацкая літаратура». Друкаваўся з 1938. У аповесцях «Землякі» (1948), «Насустрач» (1951), «Будзьце здаровы» (1953), «Пасля вяселля» (1956), «Месца ў жыцці» (1960), «Блакітная мара» (1985), зб-ках апавяданняў «Пісьмо да сябра» (1966), «На зімнім возеры» (1970) партыз. барацьба супраць ням.-фаш. захопнікаў, жыццё вёскі, маральна-этычныя праблемы. Пісаў для дзяцей (аповесці «Крылаты дзень», 1961; «Чорны снег», 1962). На бел. мову пераклаў паэмы «Мцыры» і «Ізмаіл-бей» М.Лермантава, трагедыю «Макбет» У.Шэкспіра, асобныя вершы А.Пушкіна, У.Маякоўскага, рус. і ўкр. паэтаў, раманы «Звычайная гісторыя» І.Ганчарова, «Тронка» А.Ганчара, «Дарога пад ясенямі» (пад назвай «Ясеневыя прысады») Б.Саўліта, асобныя творы М.Прыляжаевай, А.Рыбакова, Л.Лагіна і інш.

Тв.: Выбр. тв. Т. 1—2. Мн., 1978; Аповесці. Мн., 1968; Светлая раніца: Аповесць і апавяданні. Мн., 1988; Дарога пачыналася ў Бярозаўцы: Аповесці. Мн., 1990.

ШАХАЎСКО́Й Аляксандр Аляксандравіч (5.5.1777, б. маёнтак Беззаботы Смаленскай вобл., Расія — 3.2.1846), рускі пісьменнік, тэатр. дзеяч. Князь. Чл. Рас. акадэміі (1810). Скончыў Шляхетны пансіён пры Маскоўскім ун-це (1792). У 1802—26 (з перапынкамі) кіраваў пецярб. драм. трупай і тэатр. вучылішчам. У 1811 арганізаваў «Маладую трупу», якая выступала з камед. рэпертуарам. Напісаў больш за 100 драм. твораў (вадэвілі, гіст. п'есы, перапрацоўкі твораў еўрап. аўтараў), сярод якіх вылучаюцца «Новы Стэрн» (паст. 1805) і «Урок какеткам, альбо Ліпецкія воды» (1815). П'есы Ш. адметныя займальнасцю інтрыгі, арыентацыяй на прастамоўе, афарыстычнасцю. У рамант. «чарадзейныя паказы» ўводзіў музыку, танцы, розныя відовішчныя эфекты. Сярод вучняў В.А.*Каратыгін*, К.С.*Сямёнава*.

Тв.: Комедии. Стихотворения. Л., 1961.

ШАХДАРЫ́НСКІ ХРЫБЕ́Т. На Пд Зах. Памірa, у Таджыкістане. Водападзел рэк Шахдара і Пяндж. Складаецца з мерыдыянальнага Ішкашымскага хр. і субшыротнага ўласна Шахдарынскага хр. (даўж. каля 100 км, выш. да 6726 м). На У працягваецца Ваханскім хр. Складзены пераважна з гнейсаў, амфібалітаў і інш. метамарфічных парод. Пераважае высакагорны рэльеф. Ледавікі (агульная пл. каля 270 км^2). На схілах высакагорныя стэпы і лугастэпы.

ШАХДА́Г, вяршыня Бакавога хрыбта Вял. Каўказа, у Азербайджане. Выш. 4243 м. Складзена з вапнякоў і даламітаў. Невял. ледавікі. Высакагорныя лугі.

ШАХ-ДЖАХА́Н (5.1.1592, г. Лахор, цяпер Пакістан — 22.1.1666), правіцель Магольскай імперыі [1627—58]. З дынастыі Вялікіх Маголаў, сын *Джахангіра*. У маладосці меў імя Хурам, у 1616 за перамогі ў Дэкане атрымаў імя-тытул Ш.-Д. («правіцель свету»). У 1622—25 узняў паўстанне супраць бацькі, але быў разбіты і памілаваны. Калі стаў Вял. Маголам (1627), забіў сваіх братоў і сваякоў, каб пазбавіцца ад прэтэндэнтаў на прастол. Пры ім пабудаваны *Тадж-Махал*, «Чырвоны форт», «Саборная мячэць» (у Дэлі) і інш.; узмацнілася пранікненне ў Індыю еўрап. гандл. кампаній. Чуткі пра смерць Ш.-Д. ў 1658 прывялі да міжусобнай вайны паміж яго сынамі, у выніку якой прастол захапіў старэйшы сын *Аўрангзеб*. Ш.-Д. быў зняволены ў сваіх пакоях да самай смерці.

ШАХДЖАХАНПУ́Р, горад на Пн Індыі, на р. Дэоха (левы прыток р. Ганг), штат Утар-Прадэш. 280 тыс. ж. (1991). Трансп. вузел, гандл.-прамысл. цэнтр

с.-г. раёна (збожжавыя, цукр. трыснёг). Тэкст. прадпрыемствы. Дывановае ткацтва.

ША́ХІ-ЗІНДА́ (перс., літар. — жывы цар), ансамбль мемарыяльна-культавых пабудоў; помнік сярэдневяковай архітэктуры ў г. Самарканд (Узбекістан). Пачаў складвацца ў 11—12 ст., у сучасным выглядзе з 14—15 ст. Уключае мазар Кусама ібн Абаса (1334, арнаментальныя насценныя размалёўкі, кафля; ч. дэкору 15 ст.), партальна-купальныя маўзалеі Шадзі-Мульк (1372), Хаджа-Ахмада (14 ст.), комплекс Туман-ака (пач. 15 ст.; чартак — 4-стаўповы купальны павільён, маўзалей, мячэць), т.зв. маўзалей Казі-задэ Румі (15 ст.) і інш. з керамічным шматколерным дэкорам.

Літ.: Немцева Н.Б., Шваб Ю.З. Ансамбль Шах-и Зинда. Ташкент, 1979.

ШАХЛА́Й Аляксандр Міхайлавіч (н. 9.6.1952, Мінск), бел. вучоны ў галіне педагогікі. Д-р пед. н. (2003). Скончыў Бел. ін-т фіз. культуры (1974). Настаўнічаў. З 1976 у Бел. акадэміі фіз. культуры (з 2003 дэкан ф-та). Навук. працы па праблемах інтэнсіфікацыі вучэбна-трэніровачнага працэсу і падрыхтоўкі высокакваліфікаваных барцоў.

Тв.: Интенсификация учебно-тренировочного процесса в спортивной борьбе. Мн., 1989 (разам з Б.М.Рыбалка); Планирование тренировочных нагрузок в микроциклах и макроциклах на предсоревновательных этапах подготовки высококвалифицированных борцов. Мн., 1990 (разам з В.С.Іўко); Совершенствование специальной выносливости борцов высшей квалификации. Мн., 1998. Совершенствование продолжительных и активных действий борцов высшей квалификации в соревновательных поединках // На пути к Сиднею. Сб. науч. трудов. Вып. 2. Мн., 2000.

і тэксталогіі як навукі. Аўтар прац па гіст. фанетыцы («Даследаванні ў галіне рускай фанетыкі», 1893—94; «Да гісторыі гукаў рускай мовы», 1896—1903; «Нарыс найдаўнейшага перыяду гісторыі рускай мовы», 1915), марфалогіі і сінтаксісе («Курс гісторыі рускай мовы», 2-е выд., 1910—11; «Нарыс сучаснай рускай літаратурнай мовы», 1913; «Сінтаксіс рускай мовы», выд. 1925—27), дыялекталогіі, лексікаграфіі, гісторыі і сучаснай рус. мове, гісторыі ўсх. славян, стараж.-рус. л-ры, укр. і бел.

А.А.Шахматаў.

мовах. Выдаў тэксты бел.-літ. летапісаў і хронік у серыі «Поўны збор рускіх летапісаў» (т. 17, 1907, з С.Л.Пташыцкім). Вял. ўвагу аддаваў Супрасльскаму спісу *Беларуска-літоўскага летапісу 1446*, зрабіў выснову пра яго рус. крыніцы. Запісваў фальклор у Барысаўскім пав. У 1914—15 чытаў у Петраградскім ун-це курс «Беларуская мова ў сучасных яе гаворках», дапамагаў Б.Тарашкевічу ў стварэнні «Беларускай граматыкі для школ». Перапісваўся з дзеячамі бел. навукі і культуры У.Дабравольскім, М.Доўнар-Запольскім, Я.Дылам, Я.Карскім, Е.Раманавым, П.Шэйнам і інш.

Тв.: Разыскания о русских летописях. М., 2001.

Літ.: Макаров В.И. А.А.Шахматов. М., 1981; Булахов М.Г. Восточнославянские

Комплекс Шахі-Зінда.

ША́ХМАТАЎ Аляксей Аляксандравіч (17.6.1864, г. Нарва, Эстонія — 16.8.1920), рускі мовазнавец. Акад. Пецярб. АН (1894). Скончыў Маскоўскі ун-т (1887). У 1906—20 старшыня Аддз. рус. мовы і славеснасці, з 1909 праф. Пецярб. ун-та. Даследаваў слав. акцэнталогію, пытанні параўнальнай фанетыкі і граматыкі слав. моў, стараж. і сучасныя індаеўрап. мовы, фін. і мардоўскую мовы. Распрацаваў гіст. марфалогію рус. мовы. Заклаў асновы вывучэння летапісаў языковеды: Биобиблиогр. словарь. Т. 1. Мн., 1976; Славяноведение в дореволюционной России: Биобиблиогр. словарь. М., 1979; Супрун А.Е., Калюта А.М. Введение в славянскую филологию. Мн., 1981. С. 323—326; Чамярыцкі В.А. Гістарыяграфія беларуска-літоўскага летапісання (дасавецкі перыяд) // Книга в Белоруссии: Книговедение, источники, библиогр. Мн., 1981.

В.У.Скалабан.

ША́ХМАТНА-ША́ШАЧНЫ КЛУБ Беларусі (з 1997 Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках Мін-ва спорту і турызму Беларусі), дзяржаўная спецыялізаваная вучэбна-спарт. ўстанова. У 1997 аб'яднаны з рэсп. спецыялізаванай школай алімп. рэзерву (Мінск). Будынак цэнтра (да 1985 «Палац шахмат») рэканструяваны ў 1985 (арх. рэканструкцыі — С.Б.*Неўмывакін*). Асн. змест дзейнасці цэнтра — папулярызацыя і арганізацыметадычнае забеспячэнне развіцця шахмат і шашак на Беларусі, падрыхтоўка спартсменаў, спартсменаў-інструктараў нац. каманд Беларусі па шахматах і шашках, арганізацыя і правядзенне спарт. мерапрыемстваў і спаборніцтваў, наладжванне міжнар. спарт. сувязей. Цэнтр (2003) мае аддзяленні шахмат і шашак, у 21 групе займаюцца 194 вучні. Сярод выпускнікоў аддз. шахмат — шматразовыя чэмпіёны Беларусі міжнар. гросмайстры С.Азараў, А.Аляксандраў, Г.Лагвілава, І.Раманава, міжнар. майстры А.Жыгалка, Н.Папова, І.Цяценькіна і інш.; шашак — чэмпіён свету А.*Гантварг*, віцэ-чэмпіёнка свету І.Пашкевіч, міжнар. гросмайстры А.Булатаў, А.Валюк, міжнар. майстры В.Варушыла, В.Садоўская і інш. Пры цэнтры дзейнічае (2003) клуб аматараў шахмат «Ладдзя».

Г.Н.Бугрым.

ША́ХМАТНЫ ГАДЗІ́ННІК, спецыялізаваны *гадзіннік* для адліку часу, затрачанага шахматыстамі на абдумванне хадоў. Бываюць мех. і электронныя. У корпусе Ш.г. ўбудаваны 2 аднолькавыя гадзіннікавыя механізмы з сістэмай для іх пачарговага пуску і спынення. Часам маюць лічыльнік зробленых хадоў.

ША́ХМАТЫ (ад перс. шах мат — уладар памёр), гульня, якая спалучае элементы спарт. сапернiцтва, навук. і лагічнага мыслення і маст. творчасці; від *спорту*. Гуляюць 2 праціўнікі на квадратнай дошцы, падзеленай на 64 светлыя і цёмныя палі. У кожнага гульца па 8 фігур (кароль, ферзь, 2 ладдзі, 2 кані, 2 слоны) і 8 пешак, якія яны перамяшчаюць па дошцы паводле пэўных правіл. Мэта гульні — даць мат каралю (становішча, калі кароль не можа абараніцца ад нападу фігур праціўніка).

Ш., верагодна, узніклі ў Індыі ў канцы 5 ст. ў форме т.зв. чатуранґі (гулялі 4 чалавекі). Археал. даследаванні на тэр. Узбекістана (1972) сведчаць, што гульня накшталт Ш. была вядома тут у 2 ст. У араб. краінах вядома з 7—8 ст., дзе трансфармавалася ў т.зв. шатранж (шатранґ; гулялі 2 чалавекі). Сучасную форму Ш. набылі ў 16 ст. ў еўрап. краінах (Іспанія, Італія, Францыя, Англія). Афіц. спаборніцтвы праводзяцца з 19 ст. (першы міжнар. турнір у Лондане ў 1851, першы матч на першынство свету ў 1886). У 1924 створана Міжнар. шахматная федэрацыя (ФІДЕ), якая аб'ядноўвае шахматныя арганізацыі больш чым 170 краін (2003). ФІДЕ арганізуе і праводзіць шахматныя Сусв. алімпіяды (камандныя, або т.зв. «турніры нацый») з 1927 мужчынскія і з 1957 жан.; чэмпіянаты свету: асабістыя (мужчынскія з 1886 і жан. з 1927) і камандныя з 1985 (мужчынскія). Званне міжнар. гросмайстра прысвойваецца ФІДЕ з 1950 (мужчыны) і з 1976 (жанчыны). Чэмпіё-

ны свету: В.*Стэйніц* (1886—94), Э.*Ласкер* (1894—1921), Х.Р.*Капабланка* (1921—27), А.*Алёхін* (1927—35, 1937—46), М.*Эйве* (1935—37), М.*Бацвінік* (1948—57, 1958—60, 1961—63), В.Смыслоў (1957—58), М.*Таль* (1960—61), Т.Петрасян (1963—69), Б.Спаскі (1969—72), Р.*Фішэр* (1972—75), А.*Карпаў* (1975—85, 1993—1998), Г.*Каспараў* (1980; па версіі Прафес. шахматнай асацыяцыі, ПША — 1985—2000), А.Халіфман (1999), У.Крамнік (2000, па версіі ПША), В.Ананд (2000, па версіі ФІДЕ), Р.Панамароў (2002). Чэмпіёнкі свету: В.*Менчык* (1927—44), Л.Рудзенка (1950—53), Л.Быкава (1953—56, 1958—62), В.Рубцова (1956—58), Н.*Гапрындашвілі* (1962—78), М.*Чыбурданідзе* (1978—91), Се Дзюнь (1992—94), Ж.Полгар (1995—99), Жу (Чжу) Чэнь (з 2000). У галіне шахматнай кампазіцыі (складанне спец. пазіцый для рашэння за пэўную колькасць хадоў (задачы) або за адвольную іх колькасць (эцюды) разыгрываюцца пяршынствы краін і свету, прысвойваюцца міжнар. званні майстроў і гросмайстраў. Завочныя Ш. (гульня па перапісцы) існуюць з 1694 (адзначана паміж венецыянскімі і харвацкімі купцамі); у 1928 створаны міжнар. саюз гульні ў Ш. па перапісцы (з 1951 Міжнар. федэрацыя, ІКУФ).

На Беларусі Ш. вядомы з 12 ст. Першыя нац. шахматныя гурткі ўзніклі ў 1919—20 у Мінску, Барысаве, Віцебску, Магілёве і інш. 1-ы чэмпіянат Мінска праведзены ў 1922 (пераможца А.Касперскі), у інш. гарадах Беларусі (Бабруйск, Віцебск, Гомель, Полацк) — у 1923. 1-ы чэмпіянат Беларусі сярод мужчын адбыўся ў 1924 (пераможца — С.*Разенталь*), сярод жанчын у 1928 (С.Дукер). Першы майстар спорту па Ш. на Беларусі — У.Сіліч. У пяршынствах СССР бел. шахматысты ўдзельнічалі з 1927 (перамаглі на ўсесаюзным камандным турніры), былі бронз. прызёрамі на III Спартакіядзе народаў СССР (1963). Паспяхова выступала каманда Беларусі (з 1955) у міжнар. матчах з камандамі Польшчы, Венгрыі, Германіі. Бел. шахматысты В.*Купрэйчык* і А.Капенгут неаднаразова перамагалі ў чэмпіянатах свету сярод студэнтаў у складзе зборнай каманды СССР. Шахматная федэрацыя Беларусі створана ў 1992. Сярод найб. вядомых бел. спецыялістаў па Ш. — засл. трэнеры СССР І.Я.*Баляслаўскі*, А.П.*Сакольскі*, засл. трэнеры Беларусі С.М.Бягун, Т.А.Галавей, А.З.Капенгут, А.І.Шагаловіч, М.І.Шарашэўскі. Бел. шахматысты зрабілі значны ўклад у тэорыю Ш., іх імёнамі названы некат. дэбютныя варыянты (напр., дэбют Г.М.*Верасава*, дэбют Сакольскага) і інш. Каманда шахматных кампазітараў БССР — пераможца VI і VII камандных пяршынстваў СССР. Сярод шахматных кампазітараў вызначыліся М.Бельчыкаў, І.Бондар, В.Гебельт, Я.Дзвігаў, Я.Камянецкі, Р.Сляпян, У.Сычоў, С.Цырулік і інш. Найб. поспехаў сярод бел. шахматыстаў дасягнулі міжнар. гросмайстры С.Азараў, А.Аляксандраў, Баляслаўскі, Б.*Гельфанд*, В.*Дыдышка*, К.*Зварыкіна*, А.Кавалёў, Купрэйчык, Г.Лагвілава, І.Смірын, А.Суэцін, А.Фёдараў, Ю.Шульман, Р.Эйдэльсон.

Літ.: Карпов А.Е., Гик Е.Я. Все о шахматах. М., 2000; Линдер В.И., Линдер И.М. Короли шахматного мира: Жизнь и игра сквозь призму энцикл. М., 2001; Гик Е.Я. Необычные шахматы. М., 2002; Давыдюк С.И. Начинающим шахматистам. 2 изд. Мн., 2002; Каждан М.В. Урок ведет тренер. Мн., 2002.

В.Д.Купрэйчык, Я.В.Мачалаў.

ШАХО́ВІЧ Міхась (Міхаіл Аляксеевіч; 20.11.1953, в. Сакі Падляскага ваяв., Польшча — 5.6.2000), бел. паэт. Скончыў Варшаўскі ун-т (1977). З 1977 працаваў у газ. «Ніва», з 1984 рэдактар штомесячніка «Kontrasty» («Кантрасты»). У 1990—92 кіраўнік выдавецкай суполкі «Сумежжа». Чл. праўлення Бел. літ. аб'яднання *«Белавежа»*. Друкаваўся з 1974. Аўтар паэт. зб-каў «Прамінанне» (1978), «Кліч» (1993), «Пад сузор'ямі» (1998), лірычнай паэмы «Святая ноч» (1981), зб. гумарыст.-сатыр. апавяданняў «Вада ў рэшаце» (1983) і інш.

ШАХО́ЦЬКА Людміла Пятроўна (н. 15.7.1940, г. Ржэў Цвярской вобл., Расія), бел. дэмограф, сацыёлаг і эканаміст. Д-р сацыялаг. н. (1997), канд. эканам. н. (1972). Скончыла БДУ (1962). З 1962 у НДІ эканомікі Мін-ва эканомікі Беларусі. З 1981 у Ін-це эканомікі, з 1991 у Ін-це сацыялогіі АН Беларусі. З 1994 нам. дырэктара, заг. аддзела дэмаграфічных даследаванняў Ін-та статыстыкі. Адначасова з 1975 выкладала ў Бел. эканам. ун-це, Бел. ін-це кіравання, Бел. пед. ун-це, з 2001 — у Бел. акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Навук. працы па праблемах народанасельніцтва, дэмаграфічнай палітыкі і статыстыкі, развіцця сямейна-шлюбных адносін, міграцыі, дэмаграфічнага прагназіравання, сац.-дэмаграфічных аспектаў узнаўлення насельніцтва на Беларусі. Навук. кіраўнік і выканаўца распрацовак мэтавых комплексных праграм «Умацаванне і развіццё сям'і», «Становішча жанчын, сям'і, аховы мацярынства і дзяцінства», «Сацыяльная абарона насельніцтва пры пераходзе да рыначнай эканомікі» і інш. Адзін з распрацоўшчыкаў «Нацыянальнага атласа Беларусі» (2002).

Тв.: Рождаемость в Белоруссии: (социально-экон. вопросы). Мн., 1975; Воспроизводство населения Белорусской ССР. Мн., 1985; Население Республики Беларусь в конце XX в. Мн., 1996; Миграционная ситуация в странах СНГ. М., 1999 (у сааўт.); Миграция и урбанизация в СНГ и Балтии в 90-е гг. М., 1999 (у сааўт.); Belarus // Migration in the Cis 1997—1998, Geneva, 1999; Demographic development of the Republic Belarus // New demographic faces of Europe. Springer, 2000; Economy of family and demographic situation in Belarus // European Population Conference 2001. Helsinki, 2001; Экономическая демография «Перепись населения». Мн., 2002; Комплексный прогноз развития г. Минска на период до 2020 г. Т. 1. Демографический прогноз. Мн., 2002 (у сааўт.); Трудовая миграция в СНГ: социальные и экон. эффекты. М., 2003 (у сааўт.).

ШАХ-ПАРО́Н (па мужу Няфёд) Алімпіяда Іванаўна (н. 5.8.1922, в. Шчарбачоўка Суджанскага р-на Курскай вобл., Расія), бел. актрыса. Засл. арт. Беларусі (1955). Скончыла Маскоўскае гар. тэатр. вучылішча (1944). Працавала ў Бел. філармоніі (1945), Бабруйскім абл. драм. т-ры (1946). З 1947 у Нац. акад. драм. т-ры імя М.Горкага. Сыграла ў т-ры каля 100 роляў. Актрыса шырокага творчага дыяпазону. Яе мастацтву ўласцівы глыбокае пранікненне ў сутнасць сцэн. характару, эмацыянальнасць, мяккі гумар, тонкая іронія, лірызм і драматызм. Найб. значныя ролі: Лідзія («Шалёныя грошы» А.Астроўскага), баранеса Штраль («Маскарад» М.Лермантава), Лідзія Багаеўская, Алена Пратасава, Сакалова, Клеапатра, Малання («Варвары», «Дзеці сонца», «Апошнія», «Ворагі», «Ягор Булычоў і іншыя» М.Горкага), Дэздэмона, Алівія, Рэгана («Атэла», «Дванаццатая ноч», «Кароль Лір» У.Шэкспіра), Понсія («Дом Бернарды Альбы» Ф.Гарсія Лоркі), Івета («Матухна Кураж і яе дзеці» Б.Брэхта), фру Алвінг («Здані» Г.Ібсена), місіс Туз («Усё ў садзе» Э.Олбі), Эліза («Хаціна дзядзькі Тома» Г.Бічэр-Стоу), Герарда («Дасціпная закаханая» Лопэ дэ Вэгі), Хлоя («Мёртвая хватка» Дж.Голсуарсі), Міхаліна («Трывога» А.Петрашкевіча). Інш. ролі: Яўгенія («Выгнанне блудніцы» І.Шамякіна), Таня («За другім фронтам» В.Сабко), Тоня («Старыя сябры» Л.Малюгіна), Вольга («Гады вандраванняў» А.Арбузава), Мамушка («Іван-ды-Мар'я» У.Гольдфельда) і інш.

Літ.: Смольскі Р.Б. Тэатр у прасторы часу. Мн., 1998.

А.В.Усцінава.

ШАХРА́Й Уладзімір Мацвеевіч (5.3.1898, г. Адэса, Украіна — 5.12.1979), оперны рэжысёр і спявак (барытон). Засл. арт. Беларусі (1944). Засл. дз. маст. Кыргызстана (1958). Скончыў Адэскую кансерваторыю (1920). З 1920 саліст оперных т-раў Адэсы, Баку, Масквы, Саратава, Новасібірска, з 1933 спяваў і ставіў спектаклі ў т-рах Харкава, Варашылаўграда і інш. У 1937—52 (з перапынкамі) рэжысёр Дзяржк. т-ра оперы і балета Беларусі. У 1952—64 у г. Фрунзе. Сярод пастановак на бел. сцэне: оперы «Пікавая дама» (1941), «Яўген Анегін» (1948), «Чаравічкі» (1949) П.Чайкоўскага, «Чыо-Чыо-сан» (1943), «Тоска» (1950) Дж.Пучыні, «Севільскі цырульнік» Дж.Расіні (1944, 1945), «Травіята» Дж.Вердзі (1946, 1949), «Дубровускі» Э.Напраўніка (1948), «Алека» С.Рахманінава (1949), «Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава, «Фауст» Ш.Гуно, «Дэман» А.Рубінштэйна (усе 1950), «Паяцы» Р.Леанкавала (1951).

ШАХРА́ЙСКІ РАМА́Н, пікарэскны раман, адна з першых форм зах.-еўрап. сац.-быт. рамана. Вытокі ў сярэдневяковай араб. шахрайскай навеле макаме. Зарадзіўся ў Іспаніі на мяжы Рэнесансу і Новага часу (ананімны твор «Ласарыльё з Тормеса», 1554). У цэнтры — спрытны прайдоха, авантурыст (пікара), дэкласаваны чалавек без пастаяннага месца жыхарства і пэўных за-

няткаў (здабывае сродкі для жыцця шахрайствам і крадзяжом), які на старасці пакаяўся і распавядае пра свае прыгоды. Ш.р. мае лінейную структуру: эпізоды аб'ядноўваюцца паслядоўна пры адсутнасці суцэльнага разгалінаванага сюжэта. Найб. росквіту дасягнуў у 16—17 ст. у Іспаніі (М.Алеман-і-дэ-Энера, Ф. дэ Кеведа-і-Вільегас, Л.Велес дэ Гевара). Паўплываў на развіццё еўрап. прозы ў 17 ст. (І.М.Мошэраш, Г.Грымельсгаўзен у Германіі, Ш.Сарэль, П.Скарон у Францыі), у эпоху Асветніцтва (А.Р.Лесаж, А.Ф.Прэво, П.Марыво, Вальтэр, Д.Дзідро ў Францыі, Д.Дэфо, Г.Філдынг, Т.Смолет у Англіі, К.М.Віланд у Германіі). У 18—19 ст. рысы Ш.р. выявіліся ў творчасці рус. пісьменнікаў М.Чулкова, Ф.Булгарына, В.Нарэжнага, А.Вельтмана, у 20 ст. традыцыі прадоўжылі Т.Ман, К.Х.Села.

Публ.: Плутовской роман. М., 1989.

Літ.: Плавскин З.И. Плутовской роман // Плавскин З.И. Испанская литература XVII — середины XIX в. М., 1978; Синило Г.В. Плутовской роман (Кеведо, Гевара) // Разумовская М.В., Синило Г.В., Солодовников С.В. Литература XVII—XVIII вв. Мн., 1989. *Г.В.Сініла.*

ШАХРЫСА́БЗ, горад (у 1929—35 і з 1958) у Кашкадар'інскім вілаеце Узбекістана. У раннім сярэдневякоўі наз. Кеш. 53 тыс. ж. (1991). Прам-сць: бавоўнаачышчальная, кансервавая; ф-кі маст. вырабаў, шоўкамatальная. Стараж. цэнтр нар. маст. вышыўкі і керамікі. Руіны палаца *Цімура* Аксарай (1380—1404), пахавальні Цімурыдаў Дарус-Сіядат (14 ст.), рэшткі маўзалеяў шэйха Куляля (каля 1370) і нашчадкаў *Улугбека*, т.зв. Гумбезі-Сейідан (1437/38), мячэць Кок-Гумбез (1435/36) і інш. Гіст. цэнтр Ш. ўключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны.*

ША́ХТА (ад ням. Schacht), 1) горнае прадпрыемства для здабычы карысных выкапняў падземным спосабам і адгрузкі іх спажыўцу ці абагачальнай фабрыцы.

Бываюць Ш. вугальныя, жалезарудныя, саляныя. Калі здабыча вядзецца з дапамогай струменя вады — наз. гідрашахтай. Ш. складаецца з падземных *горных выработак*, дзе праводзяцца падземныя *горныя работы, шахтавага ствала*, будынкаў і канструкцый на паверхні, каб абслугоўваць горныя работы, прымаць карысныя выкапні і рыхтаваць іх для адпраўкі спажыўцам. Людзей і грузы ў Ш. перавозіць рудніковы транспарт (гл. *Рудніковае транспартаванне*). Глыбіня — ад сотняў м да некалькіх км. Ш. на магутных радовішчах дзейнічаюць 50—70 і больш гадоў.

На Беларусі Ш. карыстаюцца на прадпрыемствах ВА *«Беларуськалій»* (г. Салігорск). 2) Вертыкальная падоўжная поласць у некаторых канструкцыях, збудаваннях (напр., Ш. печы, топкі, ліфта). *А.А.Калагрыўка.*

ША́ХТАВАЕ ПО́ЛЕ, радовішча ці яго частка, што адводзіцца адной *шахце* для распрацоўкі карыснага выкапня. Межы Ш.п. — умоўныя паверхні, што абмяжоўваюць яго па распасціранні (да 20 км) і падзенні (да 5 км). Памеры Ш.п. залежаць ад колькасці і магутнасці пластоў ці пакладаў, якія распрацоўваюцца, глыбіні распрацоўкі, вытв. магутнасці і тэрміну існавання шахты.

ША́ХТАВЫ СТВОЛ, вертыкальная ці нахіленая горная вырабатка, што злучае падземную частку *шахты* з паверхняй зямлі. Умацоўваюць Ш.с. маналітным бетонам, жалезабетонам, *цюбінгамі*. Адрозніваюць Ш.с. разведачныя, эксплуатацыйныя (гал. і дапаможныя) і спец. (для падземных збудаванняў). Гал. Ш.с. прызначаны для падымання на паверхню карысных выкапняў, дапаможныя — для перамяшчэння (спуску — падымання) людзей і грузаў, вентыляцыі, водаадліву і інш. У залежнасці ад глыбіні залягання карысных выкапняў падзяляюцца на неглыбокія (да 300 м), сярэдняй глыбіні (да 700 м), глыбокія (да 1200 м), звышглыбокія (больш за 1200 м). Дыяметр Ш.с. 4—9 м. Выкарыстоўваюць Ш.с. пры падземнай распрацоўцы радовішчаў карысных выкапняў, пракладцы *тунэляў*. *А.А.Калагрыўка.*



Схема **шахты**, якая распрацоўвае пакатыя вугальныя пласты: 1 — вентыляцыйны штрэк; 2 — ачышчальны забой (лава); 3 — адкатачны штрэк; 4 — брэмсберг; 5 — хаднікі; 6 і 8 — збудаванні галоўнага і дапаможнага ствалоў; 7 — будынак сартавання; 9 — электрападстанцыя; 10 — пародны бункер.

ША́ХТЫ, горад у Растоўскай вобл. Расіі. Засн. ў канцы 17 — пач. 18 ст., з 1867 горад. Да 1920 наз. Аляксандраўск-Грушэўскі. 224,4 тыс. ж. (1999). Чыг. станцыя. Вузел аўтадарог. Здабыча каменнага вугалю. Прам-сць: машынабудаванне і металаапрацоўка, лёгкая (тэкст., абутковая, швейная), харч.; вытв-сць буд. матэрыялаў. Тэхнал. ін-т быт. абслугоўвання. Драм. тэатр. Краязнаўчы музей.

ША́ХТЫ КРЭМЕНЕЗДАБЫЎНЫ́Я, заглыбленыя ў зямлю выпрацоўкі, у якіх у познім неаліце і ў бронзавым веку (3 — 2-е тыс. да н.э.) здабывалі крамянёвую сыравіну. Выпрацоўкі ў мелавых адорвенях пераважна з крамянёвымі праслойкамі мелі калодзежападобную форму, дыям. шахтавага ствала да 1,5 м, глыб. да 6—8 м. Выманне мелавой пароды і здабычу сыравіны рабілі наборам гарняцкіх інструментаў з рагоў высакароднага аленя. У размешчаных побач з выпрацоўкамі майстэрнях выраблялі пераважна крамянёвыя сякеры, што распаўсюджваліся ў бліжэйшым навакольлі і на аддаленай тэрыторыі. Ш.к. ўзніклі з-за попыту на высакаякасную сыравіну, неабходную для вытв-сці сякер, патрэбных у лядным (падсечна-агнявым) земляробстве. Такія помнікі выяўлены і даследаваны ў Ваўкавыскім р-не Гродзенскай вобл. (гл. *Краснасельскі археалагічны комплекс*). Іх узнікненне звязана са з'яўленнем насельніцтва *шарападобных амфар культуры* і *шнуравой керамікі культуры*. Падобныя помнікі існавалі каля г.п. Рось Ваўкавыскага р-на і на Пн ад Гродна. У канцы бронз. веку (пач. 1-га тыс. да н.э.) здабыча крэменю ў шахтах заняпала.

Літ.: Гурина Н.Н. Древние кремнедобывающие шахты на территории СССР. Л., 1976; Чарняўскі М.М., Кудрашоў В.Я., Ліпніцкая В.Л. Старажытныя шахцёры на Росі. Мн., 1996. *М.М.Чарняўскі.*

ША́ХЦІНСКІ ПРАЦЭ́С, Шахцінская справа, судовы працэс у Маскве 18.5—6.7.1928 над групай інжынераў і тэхнікаў з дарэв. стажам работы,



Шацёр.

беспадстаўна абвінавачаных у стварэнні контррэв. шкодніцкай арг-цыі, якая нібыта дзейнічала на прадпрыемствах вугальнай прам-сці Шахцінскага і інш. раёнаў Данбаса. Паводле прыгавору Вярх. суда СССР 5 чал. расстраляны, 40 зняволены на розныя тэрміны (1—10 гадоў), 4 пакараны ўмоўна, 4 апраўданы. Ш.п. паклаў пачатак масавым ганенням на старую тэхн. інтэлігенцыю, якую сав. ўлады імкнуліся замяніць выхаванымі ў сав. час спецыялістамі. У канцы 1980-х г. усе асуджаныя па Шахцінскай справе рэабілітаваны.

Літ.: Ковалев В.А. Распятие духа: Судебные процессы сталинской эпохи. М., 1997.

ШАЦЁР, шатровае пакрыццё ў архітэктуры, завяршэнне будынка (храма, вежы, ганка і інш.) ці яго часткі ў выглядзе высокай 4-граннай ці шматграннай піраміды. Выконваліся з цэглы (нахіленымі радамі ці напускам гарыз. радоў цаглін) і дрэва (мелі вянковую ці каркасную канструкцыі). Вядомы ў дойлідстве многіх народаў свету пры завяршэнні будынкаў або памяшканняў з цэнтрычнай формай плана. Пашыраны пераважна ў рус. дойлідстве 16—18 ст. На Беларусі пакрыцці ў выглядзе Ш. вядомы са старажытнасці. Найб. пашырэнне атрымалі ў 16 — пач. 20 ст. Часцей іх будавалі над замкавымі вежамі (замкі ў г.п. Мір Карэліцкага, Любча Навагрудскага р-наў Гродзенскай вобл.), ратушах, званіцах (г.п. Шарашова і в. Вяжное Пружанскага р-на Брэсцкай вобл.), храмах (царква ў в. Лахва Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл.). Рабілі Ш. таксама над галерэямі і ганкамі (Ільінская царква ў Віцебску).

ШАЦЁР-ГАРА́, другая назва горнага масіву *Чатырдаг*.

ШАЦІ́ЛА Іван Браніслававіч (28.12.1910, в. Талька Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. — 12.2.1977), бел. акцёр. Нар. арт. Беларусі (1953). Скончыў драм. курсы імя Ф.Дзяржынскага ў Мінску (1932). У 1932—61, 1967—71 працаваў у Бел. т-ры імя Я.Купалы, у 1961—67 — у Дзярж. рус. драм. т-ры Беларусі. Акцёр шырокага творчага дыяпазону, вял. сцэн. абаяння. Валодаў яркім тэмпераментам, выконваў ролі эмацыянальна, з драм. насычанасцю і сац. акрэсленасцю. Складаным псіхал. малюнкам і драматызмам вызначаліся вобразы Рыгора («Партызаны» К.Крапівы), Янкі Купалы («Шчасце паэта» В.Віткі), Касагорава («Уцёкі з ночы» бр. Тур), Сыраварава («У мяцеліцу» Л.Лявонава). Пранікнёна, з лірызмам іграў Якіма Сароку («Паўлінка» Я.Купалы), Міколу Вераса («Пяюць жаваранкі» К.Крапівы), з палымяным тэмпераментам — Тыбальта («Рамэо і Джульета» У.Шэкспіра). Сярод інш. роляў: Левановіч («Хто смяецца апошнім» К.Крапівы), Іван Зарудны («У ціхім завулку» А.Маўзона), Мікола («Пагібель воўка» Э.Самуйлёнка), Раман («Каб людзі не журыліся» А.Макаёнка), Вронскі («Ганна Карэніна» паводле Л.Талстога), Трэплеў («Чайка» А.Чэхава), Крэчат («Платон Крэчат» А.Карнейчука), Рыбакоў («Крамлёўскія куранты» М.Пагодзіна), Хельмер («Нора» Г.Ібсена). Здымаўся ў кіно: «Пяюць жаваранкі», «Першыя выпрабаванні», «Вуліца малодшага сына», «Масква—Генуя».

І.Б.Шаціла.

Літ.: Сабалеўскі А. Творчасць, сугучная думам народным // Майстры беларускай сцэны. Мн., 1960; Яго ж. Рампай асветленае. Мн., 1962. С. 35—49; Яго ж. Жыццё тэатра. Мн., 1980. С. 203—206; Бур'ян Б. Адухоўлены прафесіяналізм: (Да 60-годдзя І.Б.Шаціла) // Тэатр. Мінск. 1970. № 6.

А.В.Сабалеўскі.

І.Шаціла ў ролі Якіма Сарокі.

ШАЦІ́ЛКАВІЧЫ, першапачатковая назва горада *Светлагорска*.

ШАЦІ́ЛКІ, назва да 29.7.1961 горада *Светлагорска*.

ШАЦК, вёска ў Пухавіцкім р-не Мінскай вобл., на р. Шаць, каля аўтадарогі Мар'іна Горка — Узда. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 32 км на ПдЗ ад г. Мар'іна Горка, 68 км ад Мінска, 28 км ад чыг. ст. Рудзенск. 773 ж., 324 двары (2003). Лясніцтва. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Магіла ахвяр фашызму. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

Вядомы з 1492 як уласнасць Кішкаў, потым Радзівілаў. У 16 ст. ў Ш. пабудаваны кальвінскі збор. З 1793 у Рас. імперыі, мястэчка, цэнтр воласці Ігуменскага пав. Мінскай губ. З 1800 у Ш. працавалі цагельны і чарапічны з-ды, з 1863 — вадзяны млын, нар. вучылішча, яўр. школа, бальніца, 5 крам. З 1879 належаў Гамуліцкім. У 1886 у Ш. 184 ж., 27 двароў, валасное праўленне, царква, нядзельныя таргі і адзін раз у год кірмаш; у 1897 — 967 ж. У пач. 20 ст. каля Ш. былі 2 маёнткі: Шацк (38 ж., 1 двор) і Стары Шацк (28 ж., 4 двары). У 1917 у мястэчку 1121 ж., 166 гаспадарак. З 17.7.1924 да 4.8.1927 цэнтр *Шацкага раёна* Мінскай акр., з 4.8.1927 да 6.7.1935 і з 1.4.1960 цэнтр сельсавета Пухавіцкага, з 6.7.1935 да 11.2.1938 — Смілавіцкага, з 12.2 да 6.7.1935 і з 11.2.1938 — Рудзенскага р-наў, з 20.2.1938 у Мінскай вобл. З 1935 вёска. У Вял. Айч. вайну ням. фашысты загубілі ў Ш. больш за 800 чалавек. З 20.1 да 1.4.1960 у Уздзенскім р-не.

ША́ЦКІ Мікалай Сяргеевіч (28.8.1895, Масква — 1.8.1960), расійскі геолаг; адзін з заснавальнікаў вучэння аб геал. фармацыях. Акад. АН СССР (1953, чл.-кар. 1943). Вучыўся ў Маскоўскім ун-це (з 1913; з 3-га курса прызваны ў армію). З 1921 у маскоўскіх горнай акадэміі, геолагаразведачным ін-це, Гідрапраекце. З 1934 у Геал. ін-це АН СССР (з 1956 дырэктар). Навук. працы па параўнальнай тэктоніцы стараж. платформ, тэорыі геасінкліналей і працэсаў складкаўтварэння. Пад яго кіраўніцтвам складзены «Геалагічная карта Еўразіі», «Тэктанічная карта СССР» (1953, 1956), «Міжнародная тэктанічная карта Еўропы» (1964). Дзярж. прэмія СССР 1946. Ленінская прэмія 1958.

Тв.: Избр. труды. Т. 1—4. М., 1963—65.

ША́ЦКІ Станіслаў Тэафілавіч (1878—1934), расійскі педагог; арганізатар і кіраўнік шэрагу дзіцячых доследных устаноў. Скончыў Маскоўскі ун-т (1903). З 1905 арганізоўваў на ўскраіне Масквы першыя ў Расіі клубы для дзяцей рабочых. У 1911 (з жонкай В.М.Шацкай) арганізаваў у Калужскай губ. летнюю прац. калонію «Бадзёрае жыццё» і першую доследную станцыю па нар. асвеце, якая ў 1919—32 была комплексам н.-д. пед. устаноў, дзіцячых садкоў, пазашкольных устаноў для дзяцей і культ.-асв. для дарослых. З 1932 кіраваў Цэнтр. эксперым. лабараторыяй Наркамасветы РСФСР, адначасова быў дырэктарам Маск. кансерваторыі. Аўтар прац «Бадзёрае жыццё: З вопыту дзіцячай працоўнай калоніі» (1914, з В.М.Шацкай), «Гады пошукаў» (1924).

Тв.: Избр. пед. соч. Т. 1—2. М., 1980.

ША́ЦКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1924—27. Утвораны 17.7.1924 у Мінскай акр. 20.8.1924 падзелены на 8

сельсаветаў. 4.8.1927 раён скасаваны, яго тэр. ўключана ў Пухавіцкі, Самахвалавіцкі, Грэскі і Уздзенскі р-ны.

ШАЦЬ, рака ў Уздзенскім і Пухавіцкім р-нах Мінскай вобл., правы прыток р. Пціч (бас. р. Прыпяць). Даўж. 35 км. Пл. вадазбору 293 км^2. Пачынаецца на У ад в. Цялякава Уздзенскага р-на. Рэчышча моцнавілістае, у верхнім і ніжнім цячэнні каналізаванае. Шыр. ракі 1—3,5 м. Берагі нізкія і абрывістыя.

ШАША́, тое, што *шашэйная дарога*.

ШАШАЛЁВІЧ, Шаталевіч, бел. мастак 18 ст. Родам з в. Жыровічы Слонімскага р-на Гродзенскай вобл. У 1772 размаляваў інтэр'ер Крыжаўзвіжанскай царквы Жыровіцкага Успенскага манастыра.

ШАШАЛЁВІЧ Васіль Антонавіч (9.1.1897, в. Мхінічы Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл. — 23.10.1941), бел. драматург. Вучыўся ў духоўных вучылішчы і семінарыі ў Магілёве (1910—14), Яраслаўскім юрыд. ліцэі (1915—16). Настаўнічаў на Краснапольшчыне і ў Мінску (1917—24). У час працы ў Краснапольскай школе (1918) разам з сёстрамі і братам А.*Мрыем* стварыў тэатр. калектыў, для якога пісаў п'есы. Працаваў сцэнарыстам на кінафабрыцы ў Ленінградзе. У 1930—31 і 1937—41 рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны пасмяротна. Друкаваўся з 1920-х г. На фалькл.-этнагр. матэрыяле напісаў казку-феерыю «Апраметная» (паст. Бел. драм. студыяй у Маскве, 1925, БДТ-2, 1926), у якой алегарычнымі сродкамі паказаў гіст. лёс Беларусі. Драмы «Змрок» (паст. БДТ-1, 1927), «Воўчыя ночы» (1928—29), «Рой» (1931) прысвечаны нараджэнню новых сац.-эканам. і паліт. узаемаадносін у бел. вёсцы. У антыфаш. драме «Сімфонія гневу» (паст. БДТ-1, 1935) паказаны трагічныя перыпетыі выжывання творчай інтэлігенцыі ў атмасферы таталітарнага рэжыму. На бел. мову пераклаў драм. жарты А.Чэхава «Мядзведзь» і «Сватанне».

Тв.: Рой // Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі. Мн., 1975. Т. 2; Сімфонія гневу // Тэатр. Беларусь. 1992. № 4.

Літ.: Лаўшук С.С. Станаўленне беларускай савецкай драматургіі (20-я — пачатак 30-х гг.). Мн., 1984; Яго ж. Кандрат Крапіва і беларуская драматургія. Мн., 1986. С. 47—53; Гісторыя беларускага тэатра. Т. 2. Мн., 1985; Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. Т. 2. 2 выд. Мн., 2002. *С.С.Лаўшук.*

ША́ШАЛІ, сямейства жукоў; гл. *Тачылышчыкі*.

ША́ШКА (ад кабардзіна-чэркескага са'шхо, літар. — доўгі нож), 1) сякуча-колючая *халодная зброя*; адналязовы клінок невялікай крывізны (меншай, чым у *шаблі*) з 2-баковавострым пярэднім канцом, эфесам (без гарды) і ножнамі. Маса Ш. 1200 г, даўж. клінка 700—900 мм, шыр. 40 мм. Знаходзілася на ўзбраенні ў арміях і паліцыі шэрагу краін да сярэдзіны 20 ст. У Расіі — зброя ірэгулярнай (казацкай; у 18 ст.), рэгулярнай (у 19 ст.) кавалерыі, коннай артылерыі, афіцэраў усіх родаў войск (з канца 19 ст.), жандармерыі, коннай і пешай паліцыі. З ліквідацыяй кавалерыі і коннай артылерыі выкарыстоўвалася як парадная зброя. У 1940 уведзена парадная Ш. для агульнавайскавых генералаў і генералаў артылерыі (у 1949 заменена *корцікам*); з 1968 у СССР — ганаровая ўзнагародная халодная зброя. 2) Дымавая Ш. — сродак для дымапуску; метал. скрынка з адтулінамі ў верхняй частцы, запаламі і дымавой сумессю. 3) Падрыўная Ш. — спец. форма з прэсаванага выбуховага рэчыва. Выкарыстоўваецца для правядзення падрыўных работ.

ШАШКІ́, вёска ў Стаўбцоўскім р-не Мінскай вобл., на аўтадарозе Стоўбцы—Івянец. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 20 км на ПнЗ ад горада і чыг. ст. Стоўбцы, 98 км ад Мінска. 487 ж., 186 двароў (2003). Унітарнае прадпрыемства «Нёманскае». Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ША́ШКІ, гульня 2 партнёраў на шматклетачнай дошцы (падзеленай на цёмныя і светлыя палі) аднолькавымі, але розных колераў фігуркамі (фішкамі-Ш.), якія перамяшчаюцца па цёмных палях паводле пэўных правіл; від спорту. Мэта гульні — знішчыць фігуры праціўніка ці «заперці» іх (пазбавіць хадоў).

Паводле археал. звестак і твораў Геродота і Платона, Ш. ўзніклі ў Стараж. Егіпце і краінах Аравійскага п-ва. Існуюць Ш. рускія, англ., ням.,ісп. (на 64-клетачнай дошцы па 12 фігур у кожнага партнёра), франц., польск. (на 100-клетачнай дошцы па 20 фігур), канадскія (на 144-клетачнай 30 фігур). З 19 ст. праводзяцца нац. чэмпіянаты (у Расіі з 1896). Найб. пашыр. набылі 100-клетачныя франц. Ш., якія сталі міжнароднымі. Чэмпіянаты свету па 100-клетачных Ш. праводзяцца з 1894. 1-ы чэмпіён — І.Вейс (1894—1912). У 1947 засн. Сусв. федэрацыя Ш. (Fédération mondiale du jeu de dames, ФМЖД), якая аб'ядноўвае нац. арг-цыі 49 краін (2003). У 1947 засн. званне міжнар. гросмайстра. З 1965 праводзяцца чэмпіянаты Еўропы сярод мужчын (першапачаткова Кубак Еўропы; чэмпіён І.Куперман, 1965, з 1972 — пяршынствы свету сярод юнакоў, з 1974 — пяршынствы свету сярод жанчын. З сярэдзіны 1980-х г. пры ФМЖД існуе секцыя рус. Ш. «64». Спаборніцтвы праводзяць па розных версіях: бразільскай, рус. і інш.

Чэмпіянаты свету па рус. Ш. праводзяцца з 1993 (1-ы чэмпіянат адбыўся ў г. Пінск, Беларусь, бронз. прызёрам стаў А.Валюк). Самастойная галіна Ш. — шашачная кампазіцыя, у якой зарэкамендавалі сябе бел. шашысты чэмпіёны свету Б.Іваноў, У.Шульга. На Беларусі спаборніцтвы праводзяцца па рус. і міжнар. Ш. 1-е афіц. спаборніцтва па рус. Ш. — чэмпіянат Мінска — праведзены ў 1922 (пераможца Б.*Круталевіч*), 1-ы чэмпіянат Беларусі па рус. Ш. — у 1925. Найб. поспехаў у розны час дасягнулі: Валюк, В.Габрыэлян, М.Гелер, А.Соркіна, А.Плакхін. 1-ы чэмпіянат Беларусі па міжнар. Ш. адбыўся ў 1953. Найб. вызначыліся ў Ш. гэтай катэгорыі А.*Альтшуль*, А.*Балякін*, А.*Гантварг*, З.*Голубева*, В.Камышлеева, М.*Кац*, І.Пашкевіч, А.Прэсман, Л.*Сахненка*, М.Шавель. Федэрацыя Ш. Беларусі ўступіла ў ФМЖД у 1992. Каманда бел. шашыстаў прымала ўдзел у Сусв. шашачных алімпіядах у 1992 (1-е месца) і 2000 (3-е месца).

Літ.: Берлинков Б.Л., Рокитницкий А.В. Шашечные партии белорусских мастеров. Мн., 1983; Курилович Н.В. Заочные шашки в Беларуси. Мн., 1999; Кац М. Уроки стратегии на 100 клетках. Мн., 2000. *П.А.Шацаў.*



Шашкі: 1 — азіяцка-каўказскага ўзору; 2 — афіцэрская ўзору 1909; 3 — кавалерыйская ўзору 1927.

ШАШКІНА Тамара Рыгораўна (н. 31.10.1931, в. Ніжняя Алешня Ражскага р-на Маскоўскай вобл.), бел. актрыса. Засл. арт. Беларусі (1968). Скончыла Бел. тэатр.-маст. ін-т (1958, курс Дз.*Арлова*). З 1959 у Гродзенскім абл. драм. т-ры, з 1964 у Нац. акад. т-ры імя Я.Коласа. Выканаўца драм., лірычных, характарных роляў: у Гродзенскім т-ры — Любоў («Салдаты» В.Шаўрына), Маша («Тры сястры» А.Чэхава), Патрыцыя («Тры таварышы» паводле Э.М.Рэмарка); у т-ры імя Я.Коласа — Марыля («Бацькаўшчына» К.Чорнага), Цвяткова («Апошняя інстанцыя» М.Матукоўскага), Манаева («Трывога» А.Петрашкевіча), Маці («Зацюканы апостал» А.Макаёнка), Марына («Улада цемры» Л.Талстога), Соф'я («Зыкавы» М.Горкага), Кэт («Семнаццаць імгненняў вясны» паводле Ю.Сямёнава), Рыта Асяніна («А досвіткі тут ціхія...» паводле Б.Васільева), Беатрычэ («Слуга двух гаспадароў» К.Гальдоні), Фінея («Дурнічка» Лопэ дэ Вэгі), Эўгенія («І памяраючы дрэвы стаяць» А.Касоны), місіс Уайр («Дакрануцца вуснамі да нябёсаў» паводле Т.Уільямса) і інш.

Л.І.Брандабоўская.

ШАШКО́Ў Алесь (Аляксандр Андрэевіч; н. 3.1.1923, в. Раманаўшчына Чашніцкага р-на Віцебскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў Рэсп. парт. школу пры ЦК КП(б)Б (1950), Вышэйшыя літ. курсы (1959) і Літ. ін-т імя М.Горкага (1961) у Маскве. З 1947 працаваў у чашніцкай раённай газеце, з 1954 у час. «Калгаснік Беларусі», газ. «Літаратура і мастацтва», «Звязда», на Бел. радыё, у Мін-ве культуры Беларусі, у выд-ве «Народная асвета». Друкуецца з 1947. Аўтар зб-каў апавяд. «Змена» (1951), «Абуджэнне» (1955), «На рачных плёсах» (1956), «Ранняй вясною» (1957), «Сонца тушыць зоркі» (1959), «На вадзе і такое здараецца» (1966), зб. аповесцей «Лань — рака лясная» (1979), раманаў «Спытай сваё сэрца...» (1971), «Навальніца спее ў цішыні» (1995). У іх тэмы перажытага на вайне, пасляваен. жыцця вёскі, складанасць і непаўторнасць чалавечых характараў.

Тв.: Выбранае: Раманы. Мн., 1995.

ШАШКО́Ў Анатоль Герасімавіч (н. 28.2.1927, г. Гомель), бел. цеплафізік. Акад. Нац. АН (1980; чл.-кар. 1970). Д-р тэхн. н. (1967), праф. (1967). Засл. дз. нав. Беларусі (1978). Скончыў Сярэднеазіяцкі політэхн. ін-т (1949; Ташкент). З 1955 у Акад. навук. комплексе «Ін-т цепла- і масаабмену імя А.В.Лыкава» (у 1959—91 заг. лабараторыі, у 1971—74 і 1976—80 нам. дырэктара, 1974—76 в.а. дырэктара). У 1980—93 нам. дырэктара Ін-та прыкладной фізікі Нац. АН Беларусі. У 1976—88 гал. рэдактар «Инженерно-физического журнала». Навук. працы па цячэнні вязкіх вадкасцей, тэрмаанемаметрыі, працэсах цеплапераносу ў газах і цвёрдых целах, разліку эл. ланцугоў з цеплазалежнымі рэзістарамі, праектаванні складаных тэрмаанемаметрычных сістэм. Распрацаваў шэраг метадаў вызначэння цеплафіз. уласцівасцей вадкіх, газападобных і цвёрдых цел у шырокім дыяпазоне т-р, развіў тэорыю разліку пераносных уласцівасцей газаў.

Тв.: Терморезисторы и их применение. М., 1967; Теплопроводность газовых смесей. М., 1970 (разам з Т.М.Абраменка); Перекрестные эффекты в газовых смесях. Мн., 1976 (з ёй жа); Системно-структурный анализ процесса теплообмена и его применение. М., 1983; Теплофизика разлагающихся материалов. М., 1985 (разам з А.Ф.Шленскім, Л.М.Аксёнавым); Волновые явления теплопроводности. Мн., 1993 (разам з У.А.Бубновым, С.Ю.Яноўскім).

А.Г.Шашкоў.

ШАШКО́ЎСКІ Анатоль Віктаравіч (н. 22.11.1925, Мінск), бел. вучоны-эканаміст. Канд. эканам. н. (1963), праф. (1992). Засл. работнік нар. адукацыі Беларусі (1991). Скончыў Ленінградскі фін.-эканам. ін-т (1957). З 1963 у Бел. эканам. ун-це (у 1964—79 дэкан ф-та, у 1974—91 прарэктар). Навук. працы па праблемах эфектыўнасці фін. механізмаў ва ўмовах пераходу да рыначнай эканомікі, фарміравання і выкарыстання прыбытку на дзярж. і рэгіянальным узроўнях.

Тв.: Финансирование и кредитование промышленности. Мн., 1965 (разам з Л.А.Рубанавым, М.І.Ткачук); Финансирование и кредитование капитальных вложений. Мн., 1965 (у сааўт.); Управление финансовой деятельностью предприятия: Справ. Мн., 1995 (у сааўт.); Теория финансов. 2 изд. Мн., 1998 (у сааўт.).

ШАШЭ́ЙНАЯ ДАРО́ГА, ш а ш а, дарога з цвёрдым (жал.-бетонным, асфальтавым, асфальтабетонным і інш.) шматслойным пакрыццём для руху аўтамаб. транспарту. У навук. і тэхн. л-ры тое, што *аўтамабільная дарога*.

ШАШЭ́НЬКА Аляксандр Сцяфанавіч (н. 2.7.1937, в. Стары Дзедзін Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне вет. медыцыны. Д-р вет. н. (1990), праф. (2002). Скончыў Віцебскі вет. ін-т (1962). З 1968 у Бел. НДІ эксперым. ветэрынарыі імя С.М.Вышалескага. З 1995 у Віцебскай акадэміі вет. медыцыны. Навук. працы па пытаннях дыягностыкі шаленства свойскіх і дзікіх жывёл, распрацоўцы бівалентнай вакцыны супраць шаленства і чумы драпежных жывёл, вывучэнні прычын захворвання белавежскіх зуброў некратычным баланапастытам, метадах яго лячэння і прафілактыкі.

Тв.: Пероральная вакцинация диких кабанов против чумы (у сааўт.) // Ветеринарная наука — производству. Мн., 1979; Ветеринарно-санитарная экспертиза с основами технологии и стандартизации продуктов животноводства. Витебск, 2001.

ШВАБ Аляксей, бел. дойлід 1-й пал. 17 ст. Жыў у былой в. Задорнае (Дзяржынскі р-н Мінскай вобл.). Будаваў сядзібы і палацы ў мяст. Койданава (цяпер г. Дзяржынск) і ў в. Рубяжэвічы Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл.

ШВА́БІНСКІ (Švabinský) Макс (17.9.1873, г. Кромержыж, Чэхія — 10.2.1962), чэшскі мастак. Нар. маст. Чэхаславакіі (1945). Вучыўся ў Пражскай АМ (1891—98). Працаваў пераважна ў графіцы, а таксама ў станковым жывапісе і манум.-дэкар. мастацтве. Зазнаў уплыў сімвалізму, але ў цэлым захоўваў рамант. пафас. У творах выяўляў пышную квітнеючую прыроду, населеную рэальнымі або казачнымі, алегарычнымі персанажамі. Аўтар вітражоў «Сашэсце Св. Духа» і «Страшны суд» у саборы св. Віта ў Празе, графічных партрэтаў Я.Неруды (1901), М.Алеша (1908), І.Манеса (1917), Ю.Фучыка (1950), цыкла «Райская саната» (1916—20), станковых кампазіцый «Летняя ноч» (1911), «Жніво» (1927), «Паэт і муза» (1932), жывапісных палотнаў «Зліццё душ» (1896), «Жоўты парасон» (1908—09), іл. да кніг. Дзярж. прэмія Чэхаславакіі 1952. Іл. гл. да арт. *Чэхія*.

ШВА́БІЯ (Schwaben), гістарычная вобласць у Паўд.-Зах. Германіі ў раннім сярэдневякоўі. Першапачаткова заселена *алеманамі* (стараж. іх назва — швабы, адсюль назва вобл.). З 10 ст. на тэр. Ш. існавала герцагства, якое ўваходзіла ў склад Герм. каралеўства. У 2-й пал. 13 ст. Ш. распалася на шэраг свецкіх і духоўных княстваў (тэр. Вюртэмберга, Паўд. Бадэна, Эльзаса, ч. Швейцарыі, ч. Баварыі). Ш. была адным з важнейшых раёнаў *Сялянскай вайны 1524—26*. У 1500—1806 адна з акруг *«Свяшчэннай Рымскай імперыі»*. У далейшым найменнем «Ш.» абазначалі вобласць пашырэння швабскага дыялекту (у больш шырокім сэнсе — усю тэр. б. Ш.). Гл. таксама *Швабскі саюз*.

ШВА́БСКАЯ ВАЙНА́ 1499, Швейцарская вайна 1499. Вялася ў лют.— вер. імператарам *«Свяшчэннай Рымскай імперыі»* Максімілянам I Габсбургам і *Швабскім саюзам* супраць Швейц. саюза. Прычынай вайны стала адхіленне швейцарцамі пастаноў Вормскага рэйхстага (1495) аб правядзенні імперскай рэформы (увядзенне агульнаімперскага падатку, стварэнне агульнаімперскіх устаноў), што азначала для

Швейц. саюза рэальнае падпарадкаванне імперыі. Пасля шэрагу бітваў, у якіх імперскія войскі пацярпелі паражэнне, 22.9.1499 паміж швейцарцамі і імператарам заключаны Базельскі дагавор, паводле якога фактычна прызнавалася незалежнасць Швейцарыі ад імперыі.

ШВА́БСКІ АЛЬБ (Schwäbische Alb), Швабская Юра, куэставая града на Пд Германіі. Даўж. каля 200 км. Выш. да 1015 м. Складзена пераважна з юрскіх вапнякоў. Развіты карст. Расчлянёна прытокамі рэк Некар і Дунай. Хвойныя і букавыя лясы, хмызнякі, пусткі. Палеанталагічны рэзерват Гольцмадэн.

ШВА́БСКІ САЮ́З, палітычны і ваен. саюз імперскіх рыцараў і 22 імперскіх гарадоў Паўд.-Зах. Германіі, заключаны 14.2.1488 у г. Эслінген (*Швабія*). Створаны па ініцыятыве *Габсбургаў* з мэтай барацьбы супраць баварскіх герцагаў і швейц. кантонаў; фактычна стаў сродкам князёў у іх палітыцы замацавання феад. раздробленасці ў Германіі, аховы феад. прывілеяў і падпарадкавання гарадоў. Дваранска-княжацкая кааліцыя Ш.с. адыграла гал. ролю ў задушэнні *Сялянскай вайны 1524—26* у Германіі. У канцы 1533 — пач. 1534 у выніку паліт. і рэліг. рознагалоссяў Ш.с. распаўся.

ШВА́ГЕР, швагра, швагор, брат жонкі або муж сястры ці *швагеркі*. У бел. мове слова «Ш.» ужываецца з канца 16 ст., выцесніўшы тэрміны «зяць» (муж сястры) і «шурын» (брат жонкі).

ШВАГЕ́РКА, сястра жонкі.

ШВАЙБО́ВІЧ (дзявочае Ксенжык) Алена Пятроўна (н. 3.2.1966, Мінск), бел. спартсменка (баскетбол). Майстар спорту СССР міжнар. класа (1985), засл. майстар спорту СССР (1992). Чэмпіёнка XXV Алімп. гульняў (1992, г. Барселона, Іспанія) у складзе зборнай каманды СНД. Чэмпіёнка свету сярод моладзі (1985). Чэмпіёнка Еўропы (1989), сярэбраны прызёр сярод моладзі (1984). Гуляла ў клубных камандах: «Гарызонт» (Мінск, 1984—92); «Алімпія» (г. Познань, Польшча, 1992—94); «Дынама» (Масква, 1994—2000). Сярэбраны прызёр Гульняў добрай волі (1990, г. Сіэтл, ЗША). Сярэбраны прызёр Сусв. універсіяды (1987). Сярэбраны прызёр Кубка еўрап. чэмпіёнаў (1993). Сярэбраны прызёр чэмпіянату СССР (1989). Чэмпіёнка Расіі (1998, 1999, 2000), сярэбраны прызёр (1996). Чэмпіёнка Польшчы (1992, 1993). *А.М.Петрыкаў.*

ШВА́КШТЫ, гідралагічны заказнік рэсп. значэння ў Пастаўскім р-не Віцебскай вобл. Засн. ў 1996 з мэтай стабілізацыі гідралагічнага рэжыму ў бас. р. Страча і захавання ў натуральным стане унікальнага прыроднага комплексу з папуляцыямі рэдкіх і знікаючых відаў раслін і жывёл. Пл. 5603 га. Цэнтрам з'яўляюцца азёры Вял. і Малыя Швакшты, катлавіны якіх запоўнены магутнымі адкладамі высакаякасных сапрапеляў. Рэльеф нізінны, шмат балот. Лясы займаюць больш за 60% тэр.: хвойнікі (55%), драбналістыя (28%), ельнікі (17%). У Чырв. кнізе: тайнікі сэрцападобны і яйцападобны, ладдзян трохнадрэзаны, ятрышнік дрэмлік, пустапялёснік зялёны, асака птушканожкавая, марошка прысадзістая, бяроза карлікавая. У фауне 129 відаў наземных пазваночных, гняздуецца 10 відаў птушак, што ў Чырв. кнізе: чайка малая, гогаль звычайны, бугай вялікі, журавель шэры, кулон вялікі, сава балотная і інш. *П.І.Лабанок.*

ШВА́КШТЫ ВЯЛІ́КІЯ, возера ў Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., гл. *Вялікія Швакшты.*

ШВА́КШТЫ МАЛЫ́Я, возера ў Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., гл. *Малыя Швакшты.*

ШВАН (Schwann) Тэадор (7.12.1810, г. Нойс, Германія — 14.1.1882), нямецкі біёлаг, гістолаг і фізіёлаг, стваральнік *клетачнай тэорыі*. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1879), Парыжскай АН (1879), Бельгійскай АН (1841). Вучань І.П.*Мюлера*. Скончыў Бонскі ун-т (1833). З 1834 у Анат. музеі Берлінскага ун-та. Праф. Лувенскага (з 1839) і Льежскага (1848—80) ун-таў (Бельгія). Навук. працы па фізіялогіі страваванне (адкрыў у 1836 фермент пепсін), гісталогіі, анатоміі нерв. сістэмы. На аснове ўласных даследаванняў, прац М.Я.*Шлейдэна* і інш. вучоных у творы «Мікраскапічныя даследаванні аб адпаведнасці ў структуры і росце жывёл і раслін» (1839) сфармуляваў палажэнні аб утварэнні клетак і клетачнай будове арганізмаў. *А.С.Леанцюк.*

ШВА́НАЎСКІЯ КЛЕ́ТКІ, лемацыты, клеткі, якія ўтвараюць абалонкі перыферычных нерв. валокнаў. Названы імем Т.*Швана*, які апісаў іх (1838). Выконваюць апорную і трафічную функцыі.

ШВАРН (?—1270?), князь галіцкі, вял. князь ВКЛ з 1267. Сын галіцка-валынскага кн. *Данілы Раманавіча*. Каля 1253 ажаніўся з дачкою вял. кн. ВКЛ *Міндоўга*. У 1256 з бацькам, братамі Львом і Раманам і ваўкавыскім кн. Глебам удзельнічаў у паходзе на яцвягаў. У наступныя гады ўдзельнічаў у вызваленні некат. гарадоў з-пад мангола-татарскай улады. У 1262 дапамагаў Міндоўгу ў нападзе на мазавецкага кн. Семавіта I (забіў яго ў Яздаве пад Варшавай). Пасля смерці бацькі (1264) валодаў Усх. Галіччынай з г. Галіч, Забужжам з гарадамі Бэлз, Чэрвен, Холм, Мельнік, Дарагічын. У 1264 дапамог *Войшалку* заняць трон у ВКЛ, адпомсціць *Траняту* за забойства Міндоўга, заваяваць *Нальшчаны* і *Дзяволтву*. Быў прыхільнікам аб'яднання сіл ВКЛ і Галіцка-Валынскага княства для барацьбы супраць яцвягаў і Польшчы. Неаднаразова нападаў на Польшчу. У 1267 атрымаў ад Войшалка велікакняжацкую ўладу ў ВКЛ. Забіты братам Львом, які зайздросціў, што Войшалк перадаў уладу менавіта Ш. Пасля яго гібелі вял. князем ВКЛ стаў *Трайдзень*.

Т.Шван.

М.Шварц.

ШВАРЦ (Schwartz) Мелвін (н. 2.11.1932, Нью-Йорк, ЗША), амерыканскі фізік. Чл. Нац. АН ЗША (1975). Скончыў Калумбійскі ун-т (1953), дзе і працаваў (з 1963 праф.). У 1966—83 і з 1991 праф. Станфардскага ун-та. Навук. працы па эксперым. фізіцы высокіх энергій і элементарных часціц. Разам з інш. адкрыў Σ^0-гіперон і з'яву незахавання цотнасці ў распадах гіперонаў (1957), вызначыў спін λ- і Σ-гіперонаў (1958). Эксперыментальна даказаў існаванне мюоннага нейтрына (1962, з Л.М.*Ледэрманам* і Дж.*Стэйнбергерам*). Адкрыў піоній — звязаны стан піона з мюонам (1976). Нобелеўская прэмія 1988 (з Ледэрманам і Стэйнбергерам).

Тв.: Рус. пер. — Первый эксперимент с нейтрино высоких энергий // Успехи физ. наук. 1990. Т. 160, № 10. *М.М.Касцюковіч.*

ШВАРЦ Станіслаў Сямёнавіч (1.4.1919, г. Днепрапятроўск, Украіна — 12.5.1976), расійскі вучоны ў галіне заалогіі. Акад. Рас. АН (1970; чл.-кар. 1966). Скончыў Пецярб. ун-т (1942). З 1946 ва Уральскім філіяле Рас. АН, у 1955—76 дырэктар Ін-та экалогіі раслін і жывёл. Навук. працы па экалогіі жывёл. Распрацаваў метад морфафізіял. індыкатараў для вызначэння стану і прагнозу развіцця папуляцый жывёл, адзін з заснавальнікаў папуляцыйнай і хім. экалогіі водных жывёл.

Тв.: Эволюционная экология животных. Свердловск, 1969.

ШВАРЦ Яўген Львовіч (21.10.1896, г. Казань, Татарстан — 15.1.1958), рускі пісьменнік. Вучыўся ў Маскоўскім ун-це (1914—16). Друкаваўся з 1923. У п'есах «Голы кароль» (нап. 1934, апубл. і паст. 1960), «Чырвоная шапачка» (паст. 1937), «Снежная каралева» (паст. 1939) і інш. на сюжэты нар. казак, казак Х.К.Андэрсена створаны ўласныя жывыя і арыгінальныя характары. П'есы «Цень» (паст. 1940), «Дракон» (паст.

1962) пра механізм панавання і падпарадкавання ў таталітарным грамадстве. П'еса-прытча «Звычайны цуд» (паст. 1956; кінафільм 1965, тэлефільм 1978) пра сілу дабра і веры чалавека. Аўтар аповесцей для дзяцей «Прыгоды Шуры і Марусі», «Чужая дзяўчынка» (абедзве 1937), «Першакласніца» (1949), вершаў, апавяданняў для дзяцей, дзённікаў, успамінаў, сцэнарыяў фільмаў «Папялушка» (1947), «Дон Кіхот» (1957). Яго творам уласцівы едкая іронія, эксцэнтрычны жарт, філас. сатыра і элементы лірызму. П'есы Ш. ставілі т-ры Беларусі: «Чырвоная шапачка» — Дзярж. т-р лялек (1940, 1986), Бел. рэсп. т-р юнага гледача (1963, 1967), Магілёўскі абл. драм. т-р (1972); «Снежная каралева» — Гродзенскі абл. драм. т-р (1950), Дзярж. рус. драм. т-р (1966), Бел. т-р імя Я.Коласа (1977), Бел. т-р імя Я.Купалы (1978); «Два клёны» — Брэсцкі абл. драм. т-р (1960), т-р імя Я.Коласа (1963), Бел. т-р юнага гледача (1968), Магілёўскі абл. драм. т-р (1978); «Беласнежка і сем гномаў», «Цар-вадакрут» — Гродзенскі абл. драм. т-р (1963, 1965); «Хрусталёвы чаравічак» — рус. драм. т-р (1977); «Голы кароль» — Гродзенскі абл. драм. т-р (1979), Бел. т-р юнага гледача (1996); «Папялушка» — Бел. т-р «Лялька» (1991) і інш.

Тв.: Пьесы. Л., 1972; Телефонная книжка. М., 1997.

Літ.: Цимбал С.Л. Евгений Шварц. Л., 1961; Мы знали Евгения Шварца. Л.; М., 1966.

ШВА́РЦВАЛЬД (Schwarzwald), горны масіў на ПдЗ Германіі. Даўж. каля 160 км, шыр. 35—60 км. Выш. да 1493 м (г. Фельдберг). Складзены пераважна з гнейсаў, гранітаў і пясчанікаў. Вяршыні пакатыя, схілы абрываюцца да Верхнярэйнскай нізіны. Шыракалістыя і хвойныя лясы, лугі. Радовішчы руд урану. Рэзерваты — Фельдберг, Шліфкопф і інш. Каля падножжаў мінер. крыніцы, курорты (Бадэн-Бадэн, Бадэнвайлер і інш.).

ШВА́РЦШЫЛЬД (Schwarzschild) Карл (9.10.1873, г. Франкфурт-на-Майне, Германія — 11.5.1916), нямецкі астраном і фізік. Чл. Берлінскай АН (1912). Скончыў Мюнхенскі ун-т. З 1901 праф. Гётынгенскага ун-та і дырэктар абсерваторыі пры ун-це, з 1909 дырэктар Патсдамскай астрафіз. абсерваторыі, з 1912 праф. Берлінскага ун-та. Навук. працы па зорнай астраноміі і астрафізіцы, агульнай тэорыі адноснасці, тэорыі гравітацыі, геам. оптыцы. Заклаў асновы тэорыі зорных атмасфер і ўнутр. будовы зорак (1906). Склаў каталог фатагр. велічынь больш як 3500 зорак. Атрымаў агульныя ўраўненні зорнай статыстыкі (1910—12). Упершыню знайшоў дакладнае рашэнне ўраўнення Эйнштэйна для статыст. цэнтральна-сім. гравітацыйнага поля (1916). Прадказаў гравітацыйны калапс і вывеў формулу гравітацыйнага радыуса (Шварцшыльдаўскі радыус).

Літ.: Амбарцумян В.А. Карл Шварцшильд // Творцы науки о звездах... Л., 1930.

ШВА́РЦЭ Браніслаў (7.10.1834, Лакрыст каля г. Дынан, Францыя — 18.2.1904), дзеяч рэв. руху на Беларусі і ў Польшчы ў 1860-я г. Скончыў інж. школу ў Парыжы (1855). З 1860 інжынер на буд-ве Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі, вёў рэв. прапаганду сярод сялян Гродзенскай губ., стварыў Беластоцкую рэв. арг-цыю і кіраваў ёй. Прыхільнік апоры паўстання на нар. масы, на рэв. саюз з рус. і інш. народамі. Арганізаваў выданне агітац. л-ры на бел. мове (*«Гутарка старога дзеда»* і інш.). З ліп. 1862 чл. *Цэнтральнага нацыянальнага камітэта ў Варшаве* па падрыхтоўцы паўстання, адзін з лідэраў *«чырвоных»*. Выступаў супраць «сепаратызму» К.Каліноўскага. 23.12.1862 арыштаваны і зняволены ў Шлісельбургскую крэпасць, потым высланы ў Сібір, дзе супрацоўнічаў з нарадавольцамі. З 1891 у Галіцыі, перакладаў на польск. мову творы М.Някрасава, А.Пушкіна. Аўтар успамінаў «Сем гадоў у Шлісельбургу» (1893) і інш.

Г.В.Кісялёў.

Б.Шварцэ.

ШВА́РЦЭНБЕРГ (Schwarzenberg) Карл Філіп (15.4.1771, Вена — 15.10.1820), аўстрыйскі военачальнік. Князь. Фельдмаршал (1813). У час аўстра-тур. вайны 1788—90 афіцэр. З 1805 віцэ-прэзідэнт гофкрыгсрата (прыдворнага ваен. савета). З 1808 пасол у Расіі, Францыі. У *вайну 1812* камандаваў корпусам на Валыні ў арміі *Напалеона I*. Пасля далучэння Аўстрыі да антыфранц. кааліцыі (гл. *Напалеонаўскія войны*) галоўнакамандуючы кааліцыйных сіл (1813—14), якія ўступілі на тэр. Францыі. Разам з арміяй Г.Л.*Блюхера* разбіў франц. войскі пры Ла-Рацьер; 31.3.1814 заняў Парыж. З 1815 прэзідэнт гофкрыгсрата Аўстрыі.

ШВА́РЦЭНБЕРГ (Schwarzenberg) Фелікс Людвіг Іаган Фрыдрых [2.10.1800, г. Крумаў (цяпер Чэскі-Крумлаў, Чэхія) — 5.4.1852], аўстрыйскі дзярж. дзеяч. Князь. Фельдмаршал-лейтэнант. З 1838 пасланнік у Турыне, Парме, Неапалі. У 1848 камандзір дывізіі ў арміі І.В.*Радзецкага*, удзельнік падаўлення *рэвалюцыі 1848—49 у Італіі*. З ліст. 1848 міністр-прэзідэнт і міністр замежных спраў Аўстрыі. Яго ўрад падавіў *рэвалюцыю 1848—49 у Аўстрыі* і (пры падтрымцы войск Рас. імперыі) *рэвалюцыю 1848—49 у Венгрыі*. Паліт. курс Ш. быў накіраваны на ўстанаўленне аўстр. гегемоніі ў Цэнтр. Еўропе. У ліст. 1850 Ш. пры садзейнічанні рас. цара *Мікалая I* заключыў пагадненне з Прусіяй, якое спрыяла ўмацаванню аўстр. ўплыву ў Герм. саюзе.

ШВЕД Віктар Мікітавіч (н. 23.3.1925, в. Мора Падляскага ваяв., Польшча), бел. паэт. Засл. дз. культ. Польшчы (1971). Скончыў Бел. ліцэй у Бельску-Падляскім (1946), Акадэмію паліт. навук у Варшаве (1951), аддз. журналістыкі (1955) і бел. філалогіі (1969) Варшаўскага ун-та. Чл. літ.-маст. аб'яднання *«Белавежа»*. Друкуецца з 1957. Піша на бел. і польскай мовах. У паэт. зб-ках «Жышчёвыя сцежкі» (1967), «Дзяцінства прыстань» (1975), «Мая зялёная Зубровія» (1990), «Вясёлка», «Родны схоў» (абодва 1991) і інш. тэма вернасці роднай зямлі і мове. Піша для дзяцей. Перакладае з бел., рус., укр. моў на польскую, з польскай — на бел. мову. Некат. яго вершы пакладзены на музыку.

А.В.Мальдзіс.

ШВЕД Вячаслаў Віталевіч (7.10.1956, г. Гродна), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (2002). Скончыў БДУ (1979). Настаўнічаў, з 1982 выкладаў у Гродзенскім ун-це. З 2001 прарэктар па навук. рабоце абл. ін-та павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі. Даследуе сац.-эканам. і паліт. развіццё Беларусі ў 18—19 ст., гісторыю Гродна і Гродзеншчыны 12 — пач. 20 ст.

Тв.: Кронан: Летапіс горада на Нёмане (1116—1990 гг.). Гродна, 1993 (разам з А.П.Госцевым); Торговля в Беларуси в период кризиса феодализма (1830—1850-е гг.). Гродно, 1995; Падзеі і постаці гродзенскай даўніны. Гродна, 1995; Горадня: Аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 — канец 18 ст.). Гродна, 1997 (разам з А.П.Госцевым); Беларускія старонкі гісторыі дзекабрыстаў. Мн., 1998; Паміж Польшчай і Расіяй: Грамад.-паліт. жыццё на землях Беларусі (1772—1863 гг.). Гродна, 2001.

ШВЕД Іван Ада́мавіч (н. 5.2.1938, в. Драгабыль Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне мед. марфалогіі і фізіялогіі. Д-р мед. н. (1989), праф. (1997). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1966), дзе і працаваў з 1969. З 1975 у Бел. мед. акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Навук. працы па агульнай і дзіцячай паталогіі, тэраталогіі, па праблемах падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

Тв.: Пороки развития опорно-двигательного аппарата (разам з А.У.Руцкім) // Тератология человека. 2 изд. М., 1991; Болезни плода, новорожденного и ребенка. 2 изд. Мн., 1996 (у сааўт.).

ШВЕ́ДЗІК Генадзь Барысавіч (4.3.1914, г. Бабруйск Магілёўскай вобл. — 11.10.1942), яўрэйскі паэт. Скончыў Мінскі пед. ін-т (1937). Працаваў у перыяд. друку, настаўнікам, з 1940 у Ін-це мовы, л-ры і мастацтва АН Беларусі. Загінуў на фронце ў Вял. Айч. вайну. Друкаваўся з 1929. Аўтар паэт. зб-каў «Старт» (1934), «Вершы» (1939), паэмы для дзяцей «Наш Джым» (1935). Яго паэзія прысвечана сяброўству, каханню, нялёгкай салдацкай службе; ёй уласцівы элегічнасць, лірызм. На бел. мову вершы Ш. перакладалі Э.Агняцвет, Р.Барадулін, А.Вольскі, А.Вялюгін і інш.

Тв.: Бел. пер. — Лірыка. Мн., 1962; Матчына сляза: Вершы, лісты. Мн., 1989.

Р.Л.Рэлес.

ШВЕ́ДСКА-НАРВЕ́ЖСКАЯ У́НІЯ 1814—1905, дзяржаўна-прававое аб'яднанне Швецыі і Нарвегіі на падставе рэальнай *уніі*. Навязана Нарвегіі Швецыяй у выніку швед.-нарв. вайны 1814, набыла сілу 4.11.1814 з выбраннем каралём Нарвегіі швед. караля Карла XIII.

Адносіны бакоў у уніі рэгуляваў «Дзярж. акт» (Rikzakt) ад 6.8.1815, прыняты парламентамі абедзвюх дзяржаў. Швецыя і Нарвегія мелі агульнае дыпламат. ведамства, кожная з іх захоўвала свае законы, кіраванне, суды, царкву. Нарв. армія (афіцэры — толькі нарвежцы) знаходзілася пад камандаваннем караля, але яе выкарыстанне па-за межамі Нарвегіі патрабавала санкцыі нарв. сторцінга (парламента). Прызначэнне каралём членаў нарв. ўрада праводзілася паводле рэкамендацыі сторцінга, які захаваў таксама права распараджацца фінансамі краіны і даваць нарв. грамадзянства. 7.6.1905 сторцінг, які абапіраўся на моцны антышвед. рух у краіне і падтрымку ўрадаў Расіі і Вялікабрытаніі, абвясціў аб разрыве уніі. За яе спыненне амаль аднагалосна выказаліся ўдзельнікі плебісцыту ў Нарвегіі (13.8.1905). Скасаванне уніі афармлена швед.-нарв. *Карльстадскімі пагадненнямі 1905.*

ШВЕ́ДСКА-ПО́ЛЬСКАЯ У́НІЯ 1592—99, асабістая унія паміж Шведскім каралеўствам і Рэччу Паспалітай. Узнікла пасля смерці караля Швецыі Юхана III [1568—92], сын якога, польскі кароль і вял. кн. ВКЛ (з 1587) *Жыгімонт III* (Сігізмунд III) атрымаў у спадчыну ад бацькі таксама швед. прастол. Унія засталася ў значнай ступені фармальнай, бо Швецыя, дзе ў 1592 у якасці дзярж. рэлігіі канчаткова зацвердзілася *лютэранства*, не жадала падпарадкоўвацца заўзятаму каталіку Жыгімонту III, які не хаваў сваіх намераў аднавіць у гэтай краіне каталіцызм. У 1595 фактычным правіцелем Швецыі стаў дзядзька караля Карл (у 1604—11 кароль Карл IX). У 1598 ён разбіў каля Стонгебру войскі Жыгімонта III, які высадзіўся ў Швецыі, і ў 1599 дамогся пазбаўлення яго швед. кароны. Ш.-п.у. перастала існаваць. Імкненне Жыгімонта III аднавіць яе прывяло да *вайны Рэчы Паспалітай са Швецыяй 1600—29.*

М.Г.Нікіцін.

ШВЕ́ДСКАЯ МО́ВА, адна з *германскіх моў* (паўн. падгрупа); мова *шведаў*. Афіц. мова *Швецыі*, адна з афіц. моў *Фінляндыі*. Пашырана таксама ў ЗША і Канадзе. Мае 7 груп дыялектаў: гаворкі свейскія, ёцкія, нарландскія, гутнійскія, паўн.-швед., усх.-швед., нарвежска-шведскія. Ш.м. ўласцівы: у фанетыцы — наяўнасць доўгіх і кароткіх галосных і зычных гукаў, муз. націск; у марфалогіі — 4 тыпы спражэння дзеяслова, захаванне супіна, які выступае ў якасці назменнай часткі аналіт. форм дзеяслова, агульны і ніякі род, 2 лікі і 2 склоны ў сістэме назоўніка, катэгорыя азначальнасці ў прыметніку; у сінтаксісе — цвёрды парадак слоў у сказе. Найстараж. пісьмовыя помнікі — рунічныя надпісы 9—12 ст. (каля 2500; гл. *Рунічнае пісьмо*). Помнікі лац. алфавітам з 13 ст. Сучасная літ. мова склалася ў 16—17 ст. на аснове свейскіх гаворак.

Літ.: Попов О.К., Попова Н.М. Шведский язык. М., 1969.

А.Я.Міхневіч.

ШВЕ́ДСКІЯ МУ́ХІ (Oscinella), род *злакавых мух*, шкоднікі раслін сям. мятлюжковых. Каля 30 відаў. Пашыраны паўсюдна, найб. аўсяная (O. frit), якая пашкоджвае пераважна авёс, і ячменная (O. pusilla), пашкоджвае ячмень і пшаніцу. Шкодзяць таксама азімаму жыту, кукурузе і інш.

Шведская муха: 1 — дарослае насякомае; 2 — яйцы; 3 — пашкоджаная расліна.

Даўж. 1,5—3 мм, цела чорнае, знізу светлажоўтае; крылы празрыстыя з метал. бляскам. Мухі вылятаюць вясной, адкладваюць яйцы на праросткавую плеўку злакаў. Лічынкі пранікаюць унутр усходаў, дзе кормяцца асновай цэнтр. ліста і эмбрыянальным зародкам коласа. Пашкоджаныя расліны моцна кусцяцца, адстаюць у росце і развіцці. Зімуюць лічынкі, зрэдку кукалкі. За год даюць 2—5 пакаленняў.

ШВЕ́ДЫ, народ, асн. насельніцтва *Швецыі* (7,9 млн. чал., 2002). Жывуць таксама ў ЗША (870 тыс. чал., 1992), Фінляндыі (310 тыс. чал.) і інш. Агульная колькасць 9,4 млн. чал. (1992). Гавораць на швед. мове. Вернікі — хрысціяне (пераважна лютэране).

ШВЕ́ЙНАЯ МАШЫ́НА, машына, якая злучае нітачным швом дэталі швейных вырабаў, робіць іх аддзелку і аздабленне, дэкар. строчку, вышыўку, прышыванне гузікаў, абкідванне петляў і інш.

Бываюць бытавыя і прамысловыя, з ручным, нажным і эл. прыводам; чаўнаковыя (для ўсіх тканін) і ланцуговыя (для трыкатажу; у іх замест чаўнака — пятліцель); універсальныя (найб. пашыраны аднаіголкавыя сточвальныя) і спецыялізаваныя (зігзаг-машыны, пяцельныя, патайнога шыўка, фастрыгавальныя, абкідвальныя, замацавальныя, гузікавыя і інш.). Ёсць таксама Ш.м. для *бязнітачнага злучэння* дэталей. Ш.м. робяць да 1500 шыўкоў за мінуту (прамысл. да 5500). Выкарыстоўваюцца ў швейнай, трыкатажнай, абутковай і інш. вытв-сцях, у побыце. Першая Ш.м. вынайдзена ў 1755 у Вялікабрытаніі (Ч.Ф.Вейзенталь). Далейшае развіццё (ад выявення асноўных рухаў рукі пры шыцці да знаходкі іголкі з вушкам на канцы да зубчастай пласцінкі, што перасоўвае тканіну) Ш.м. атрымала ў 19 ст. ў ЗША (Э.Хоў, А.Вільсан, І.М.Зінгер). На Беларусі розныя тыпы Ш.м. выпускае акц. т-ва *«Орша»*.



Схема **швейнай машыны**: 1 — чаўнок; 2 — рэйка; 3 — іголка; 4 — рэгулятар націяжэння верхняй ніткі; 5 — галоўны вал; 6 — рукаў; 7 — махавік.

ШВЕ́ЙНАЯ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, галіна *лёгкай прамысловасці*, прадпрыемствы якой займаюцца пашывам верхняга адзення (мужчынскага, жаночага, дзіцячага), бялізны, прадметаў жан. туа-

лету, галаўных убораў, вырабаў тэхн. прызначэння. У сваім размяшчэнні арыентуецца на прац. рэсурсы і раёны спажывання прадукцыі (буйныя гарады), з'яўляецца адной з пашыраных галін прам-сці. Найб. развітую Ш.п. маюць ЗША, Японія, Вялікабрытанія, Францыя, Кітай, Італія, Германія, Расія і інш. На яе долю на Беларусі ў 2001 прыпадала 1,5% выпуску ўсёй прамысл. прадукцыі, 1% асн. вытв. фондаў і 5,2% прамыслова-вытв. персаналу, 33,9% усяго прыбытку, атрыманага лёгкай прам-сцю; рэнтабельнасць вытв-сці склала 11,1%.

Пашыў швейных вырабаў на Беларусі пачаўся ў 17 ст., але пераважала саматужная вытв-сць, асабліва на вёсцы. Толькі ў гарадах (Мінск, Віцебск, Гомель і інш.) існавалі невял. майстэрні па пашыве швейных вырабаў. Буйная Ш.п. на Беларусі пачала стварацца ў 1930-я г., калі былі пабудаваны буйныя прадпрыемствы: ф-кі «Сцяг індустрыялізацыі» ў Віцебску, імя Крупскай у Мінску, імя Валадарскага ў Магілёве, «Камітэрн» у Гомелі і інш.

На 1.1.2003 на Беларусі дзейнічае больш за 250 прадпрыемстваў Ш.п. Сярод іх ёсць буйныя прадпрыемствы, якія спецыялізуюцца на пэўных швейных вырабах («Камінтэрн» у Гомелі, «Сцяг індустрыялізацыі» ў Віцебску, «Мілавіца» і «Прагрэс» у Мінску, «Калінка» ў Салігорску, «Эліз» у Дзяржынску, «Вяснянка» ў Магілёве, *Бабруйская фабрыка мастацкіх вырабаў*, *Магілёўская фабрыка мастацкіх вырабаў* і інш.). Швейныя вырабы выпускаюць таксама некат. раённыя камбінаты каап. прам-сці, швейныя майстэрні ў месцах зняволення, асобныя індывід. прадпрыемствы. Дзейнічаюць сумесныя прадпрыемствы («Джэрсі» ў Брэсце, «Гартэн» у Баранавічах і інш.). Частка швейных вырабаў ідзе на экспарт. У 2001 экспарт верхняга жан. адзення склаў 62,9 млн. дол., у т.л. ў Расію 21,2 млн., у ЗША 14,6 млн., у Германію 7,1 млн., на Віргінскія а-вы 6,9 млн., у Нідэрланды 5,3 млн.; інш. жан. адзення — 36,6 млн. дол., у т.л. ў ЗША 14,3 млн., у Германію 9,4 млн., у Нідэрланды 5,4 млн., у Расію 3,6 млн. дол. *П.І.Рогач.*

Вытворчасць швейных вырабаў на Беларусі (тыс. шт.)

Вырабы	1990	1995	2001
Паліто, паўпаліто	3656	1261	1581
з іх шарсцяныя	2824	623	1198
Плашчы	448	398	266
Касцюмы	3034	674	958
Сукенкі (у т.л. сарафаны, халаты)	13219	1222	1001
Блузкі	1301	1000	1305
Кашулі верхнія	9662	3211	2665

ШВЕЙЦА́РСКІ ПАХО́Д СУВО́РАВА 1799, пераход рас. войск на чале з А.В.*Суворавым* з Паўн. Італіі праз Альпы ў Швейцарыю і Аўстрыю 21.9—8.10.1799 у час вайны 2-й антыфранц. кааліцыі (Вялікабрытанія, Аўстрыя, Расія, Турцыя і інш.) супраць Францыі. У адпаведнасці з англа-аўстр. стратэг. планам пасля *Італьянскага паходу Суворава 1799* яго войскі (21,5 тыс. чал., у т.л. 4,5 тыс. аўстрыйцаў) былі накіраваны ў Швейцарыю, каб адтуль пасля злучэння з рас. корпусам ген. А.М.Рымскага-Корсакава (24 тыс. чал.) і аўстр. войскамі наступаць на Францыю. Суворaў пайшоў у Швейцарыю самым кароткім шляхам — праз Альпы, якія лічыліся амаль непраходнымі для войск. З цяжкімі баямі ён авалодаў перавалам Сен-Гатард і Чортавым мостам (праз р. Рэйс) і выйшаў да Люцэрнскага воз., дзе даведаўся пра разгром франц. арміяй ген. А.Масены корпуса Рымскага-Корсакава і акружэнне сваіх войск утрая пераўзыходзячымі франц. сіламі. Ратуючы сваю армію ад разгрому, Суворaў павёў яе на У. Ён спалучаў абыходы з франтальнымі ўдарамі, выбіў франц. атрады з шэрагу перавалаў, пераадолеў бездарожны хрыбет Панікс і вывеў свае гал. сілы (15 тыс. чал.) разам з 2800 палоннымі у Аўстрыю. Ш.п. — выдатны прыклад паспяховых манеўраных баявых аперацый у гарах супраць пераўзыходзячых сіл праціўніка.

Літ.: Данилов А. «Русский штык прорвался сквозь Альпы!» // Армия. 1999. № 5.

М.Г.Нікіцін.

ШВЕЙЦА́РЦЫ, агульная назва насельніцтва *Швейцарыі*. Уключае германашвейцарцаў (4,7 млн. чал., 2002), франка-швейцарцаў (1,3 млн. чал.), італашвейцарцаў (730,2 тыс. чал.), рэтараманцаў (73 тыс. чал.). Гавораць адпаведна на ням., франц., італьян. і рэтараманскай мовах. Вернікі — пратэстанты (б.ч. германа-швейцарцаў, франка-швейцарцаў, рэтараманцаў) і католікі (італа-швейцарцы і інш.).

ШВЕЙЦА́РЫЯ (ням. Schweiz, франц. Suisse, італьян. Svizzera), Швейцарская Канфедэрацыя (ням. Schweizerische Eidgenossenschaft, франц. Confédération Suisse, італьян. Confederazione Svizzera), дзяржава ў Цэнтр. Еўропе. Мяжуе на Пн з Германіяй, на У з Ліхтэнштэйнам і Аўстрыяй, на Пд з Італіяй, на З з Францыяй. Пл. 41,3 тыс. км². Нас. 7302 тыс. чал. (2002). Афіц. мовы: нямецкая (германа-швейцарская), французская, італьянская, рэтараманская. Сталіца — г. *Берн*. Краіна падзяляецца на 23 кантоны (3 з іх падзелены на паўкантоны). Нац. свята — Дзень заснавання Канфедэрацыі (1 жніўня).

Герб і сцяг **Швейцарыі**.

Дзяржаўны лад. Ш. — федэратыўная парламенцкая рэспубліка. Кіраўнік дзяржавы і ўрада — прэзідэнт Канфедэрацыі, які на аснове ратацыі выбіраецца на 1 год парламентам з членаў урада — федэральных саветнікаў; ён


ШВЕЙЦАРЫЯ
Маштаб 1:4 500 000
Г Е Р М А Н І Я
Ф Р А Н Ц Ы Я
А Н Г Л І Я
А В С Т Р Ы Я
І Т А Л І Я
Ліхтэнштэйн
Бельфор
Мюлуз
Манбельяр
Базель
Фрауэнфельд
Вінтэртур
Брэгенц
Цюрых
Санкт-Гален
Інсбрук
Безансон
Ольтэн
Аарау
Фельдкірх
Ла-Шо-дэ-Фон
Ле-Локль
Золатурн
Цуг
Рапэрсвіль
Блудэнц
Біль
Люцэрн
Швіц
Вадуц
Пантарлье
Неўшатэль
Берн
Кур
Давос
Івердон
Фрыбур
Тун
Інтэрлакен
Санкт-Морыц
Лазана
Вэве
Мантро
Ньён
Жэнева
Танон-ле-Бэн
Сьён
Фісп
Сімплонскі тунэль
Лакарна
Белінцона
Сондрыо
Мартыньі
Цэрмат
Клюз
Анесі
Аоста
Варэсэ
Лугана
Турын
Мілан
Генуэзскі з.
Ліонскі з.
Венецыянскі з.
Альпы
Пенінскія Альпы
Бернскія Альпы
Лепантынскія Альпы
Гарнэрскія Альпы
Рэйн
Рона
Тічына
Ааре
Рэйс
Сан
Дуб
Ліма
Інн
Адда
Тэсэна
Дора-Рыпарыя
Тыцына
Ада
Мінчыо
Па
Тыбр
Арно
Сіена
Рым
Неапаль
Сардзінія
Сіцылія
Мальта
Трыпалі
Бізерта
Алжыр
Тунісскі з.
Алжырскі з.
Сардзінскае м.
Ліпарскія а-вы
Тырэнскае м.
Іанічнае м.
Міжземнае м.
Сіцылійскі праліў
Мальтыйскі праліў
Ліпарскія а-вы
Эгадскія а-вы
Пантэлерыя
Лампедуза
Гозо
Кіркенскія горы
Атлас
Сахара
Ліўійская пустыня
Нубійская пустыня
Егіпецкая пустыня
Аравійская пустыня
Чырвонае м.
Суэцкі канал
Егіпет
Ліван
Сірыя
Ізраіль
Іарданія
Кіпр
Турцыя
Грэцыя
Балканскі п-аў
Чорнае м.
Балгарыя
Румынія
Венгрыя
Славакія
Польшча
Чэхія
Аўстрыя
Германія
Францыя
Бельгія
Нідэрланды
Люксембург
Швейцарыя
Ліхтэнштэйн
Італія
Іспанія
Партугалія
Марока
Алжыр
Тунісія
Лівія
Егіпет
Ізраіль
Іарданія
Сірыя
Ліван
Кіпр
Турцыя
Грэцыя

старшынстве на пасяджэннях Федэральнага савета і выконвае ў асн. прадстаўнічыя функцыі. Кожны кантон мае сваю канстытуцыю, парламент і ўрад. Дзейнічае федэральная канстытуцыя 1848, перапрацаваная ў 1874. Заканад. ўлада належыць Федэральнаму сходу, які складаецца з 2 раўнапраўных палат: Нац. савета (200 дэпутатаў) і Савета кантонаў (46 дэпутатаў). Нац. савет выбіраецца галасаваннем паводле прапарцыянальнай сістэмы на 4 гады, Савет кантонаў (па 2 дэпутаты ад кантона і 1 ад паўкантона) — паводле мажарытарнай сістэмы (апрача кантона Юра). У некаторых кантонах дэпутаты ў Савет кантонаў выбіраюцца на сесіях кантанальных парламентаў, у іншых — прамым галасаваннем насельніцтва. Старшыні палат выбіраюцца штогод. Калектыўным кіраўніком дзяржавы і вышэйшым органам выканаўчай улады з'яўляецца Федэральны савет (урад), у склад якога ўваходзяць 7 федэральных саветнікаў, што выбіраюцца Федэральным сходам на 4 гады. Усе федэральныя саветнікі роўныя ў правах і прымаюць рашэнні на калегіяльнай аснове. Кожны з іх кіруе адным з 7 федэральных дэпартаментаў (мін-ваў) і пры афіц. візітах за мяжу прадстаўляе Федэральны савет у цэлым.

Прырода. Ш. — адна з гарыстых краін Еўропы. 60% яе тэр. на Пд, У і ў цэнтры займаюць Альпы, асн. хрыбты якіх (Бернскія, Гларнскія, Лепанцінскія, Рэтыйскія, Пенінскія Альпы) выцягнуты з ПдЗ на ПнУ. Найб. выш. краіны — пік Дзюфур (4634 м) у масіве Монтэ-Роза. Горы пераважна спічастыя, складзеныя з крышт. парод, парэзаныя сеткай далін, што робіць іх даступнымі для трансп. сродкаў. Асн. перавалы: Сен-Гатард (2108 м), Сімплон (2005 м), Вял. Сен-Бернар (2469 м). У верхнім поясе гор фірнавыя палі і ледавікі (пл. каля 2 тыс. км^2). На З і ПдЗ — вапняковыя горы Юра (выш. да 1680 м). Паміж Альпамі і Юрой — Швейцарскае пласкагор'е (выш. 400—600 м). Карысныя выкапні: графіт, тальк, каменная соль, жал. руда і буры вугаль (невял. запасы), сыравіна для выт-сці буд. матэрыялаў. Клімат умераны на пласкагор'і, халодны ў гарах. Сярэдняя т-ра студз. ў Жэневе каля 0 °С, ліп. 19 °С, у гарах -7 °С і 12 °С адпаведна. Ападкаў за год 800—1200 мм на пласкагор'і і да 2500 мм на зах. схілах Альпаў. Зімой у гарах выпадае шмат снегу, частыя сходы лавін. Рачная сетка густая, рэкі кароткія, паўнаводныя, багатыя запасамі гідраэнергіі. Гал. рэкі Рэйн з прытокам Аарэ і Рона. Шмат азёр, найб. з іх Жэнеўскае, Бодэнскае, Цюрыхскае і інш. Глебы на Швейцарскім пласкагор'і бурыя лясныя, у гарах лясныя, падзолістыя і горна-лугавыя. Лясы займаюць 24% тэрыторыі. Ніжняя ч. гор укрыта шыракалістымі лясамі (дуб, бук), ад 1800 да 2400 м хвойныя лясы, да 2800 м субальпійскія і альпійскія лугі, вышэй скалы, снежнікі і ледавікі. У складзе жывёльнага свету высакагор'яў буры мядзведзь, ліс, дзікі кот, куніца, алень, горны казёл, сарна, заяц, вавёрка, у рэках — стронга. Швейц. нац. парк Энгадзін. Горы Ш. шырока выкарыстоўваюцца ў мэтах турызму, альпінізму і гарналыжнага спорту.

Насельніцтва. Нац. склад насельніцтва разнастайны: германа-швейцарцы — 64,4%, франка-швейцарцы — 18,4%, італа-швейцарцы — 9,8%, рэтараманцы — 0,8%. У краіне 1,3 млн. замежных грамадзян (іспанцы, туркі і інш.). Каля 46% насельніцтва католікі, 44% — пратэстанты, ёсць вернікі іудзеі, мусульмане і інш. Натуральны прырост 0,1% (2002). Сярэдняя шчыльн. 177 чал. на 1 км^2. Каля 68% насельніцтва жыве ў гарадах. Найб. гарады (з прыгарадамі; тыс. ж., 1998): Цюрых — 935, Жэнева — 440, Базель — 410, Берн — 335, Лазана — 295. У прам-сці занята 26,3% эканамічна актыўнага насельніцтва, у сельскай гаспадарцы — 4,6%, у абслуговых галінах — 69,1%.

Гісторыя. Чалавек на тэр. Ш. вядомы з часоў палеаліту. У старажытнасці тут жылі кельцкія плямёны гельветаў (ад іх Ш. часам наз. *Гельвецыя*) і рэты, якіх у 58 і 15 да н.э. падпарадкавалі стараж. рымляне. Усх. частка краіны ўваходзіла ў рым. правінцыю Рэцыя, зах. — у прав. *Галія* (адсюль гіст. карані пашырэння ў Ш. рэтараманскай, італьян. і франц. моў). У 5 ст. н.э. на З Ш. пасялілся бургунды, на Пн — *алеманы*. З 536 краіна пад уладай франкаў (з 843 усх. франкаў), каля 900 яе зах. частка адышла да *Бургундыі*, разам з якой у 1032—34 увайшла ў *«Свяшчэнную Рымскую імперыю»*. З 2-й пал. 13 ст. на ПдЗ Ш. ўладарылі графы савойскія, на Пн і У — *Габсбургі*. З сярэдзіны 13 да канца 15 ст. швейцарцы змагаліся за незалежнасць ад Габсбургаў (да тых часоў належыць паданне пра В.*Тэля*). У жн. 1291 тры лясныя кантоны (Уры, Швіц і Унтэрвальдэн) заключылі паміж сабой «вечны саюз», што стала пачаткам існавання Ш. як асобнай дзяржавы (1 жн. — нац. свята краіны). Іх аб'яднаныя сілы перамаглі аўстр. рыцарскае войска каля Моргартэна (1315). У ходзе антыгабсбургскага змагання ў «вечны саюз» уступілі ў якасці новых кантонаў Люцэрн (1332), Гларус і Цуг (1352), імперскія гарады Цюрых (1351) і Берн (1353), што пашырыла тэр. «старой» Швейц. канфедэрацыі, якая праіснавала да 1798 і да таго часу не мела пастаяннай цэнтр. дзярж. улады, агульнасаюзных адміністрацыі, войска, фінансаў. Пасля паражэнняў ад швейцарцаў пры Земпаху (1386) і Нефельсе (1388) Габсбургі заключылі са Швейц. канфедэрацыяй спрыяльны для яе мір. Ад назвы кантона Швіц пайшла агульная назва краіны — Швейцарыя. У 1415 да яе далучана Ааргаў, у 1460 — Тургаў. Пасля паспяховага ўдзелу ў бургундскіх войнах 1474—77 швейц. пяхота атрымала міжнар. прызнанне як выдатная баявая сіла, а ваен. наёмніцтва стала дзярж. промыслам (швейц. гвардзейцы да нашага часу ахоўваюць рым. папу). У 1481 да канфедэрацыі далучаны Фрайбург і Золатурн. Пасля *Швабскай вайны 1499* Ш. вызвалілася з-пад улады «Свяшчэннай Рым. імперыі» (Базельскі мір 1499). У выніку прыняцця ў свой склад Базеля, Шафгаўзена (1501) і Апенцэля (1513) Ш. стала саюзам 13 кантонаў. У 1-й пал. 16 ст. ўзнік рэфармацыйны рух (гл. *Рэфармацыя*) на чале з У.*Цвінглі* (з 1519 жыў у Цюрыху), Ж.*Кальвінам* (у Жэневе) і інш.; у большасці гар. канто-

Да арт. **Швейцарыя**. Горнае возера.

Да арт. **Швейцарыя**. Берн. Стары горад.

наў усталяваўся пратэстантызм у форме *кальвінізму*, альпійскія кантоны (Уры, Швіц, Унтэрвальдэн, Люцэрн, Цуг, Фрайбург, Золатурн) засталіся каталіцкімі. Паводле *Вестфальскага міру 1648* Швейц. саюз атрымаў міжнар. прызнанне. У 1674 дэкларавана палітыка нейтралітэту. У час *напалеонаўскіх войнаў* на тэр. Ш. адбыўся *швейцарскі паход Суворава 1799*, існавала залежная ад Францыі *Гельветычная рэспубліка* (1798—1803), у якой упершыню ў гісторыі Ш. створана цэнтр. ўлада і ўведзена канстытуцыя. Паводле рашэнняў *Венскага кангрэса 1814—15* прызнаны незалежнасць і нейтралітэт Ш. (22 кантоны). Унутрыпаліт. барацьба паміж лібераламі і кансерватыўнымі каталіцкімі коламі (апошнія ў 1840-я г. ўтварылі свой блок — Зондэрбунд) прывяла да грамадз. вайны 1847 і перамогі лібералаў. Паводле канстытуцыі 12.9.1848 Ш. стала федэратыўнай дзяржавай з цэнтрам у г. Берн; цэнтралізаваны пошта, мытня, грашовая сістэма, сістэмы мер і вагаў. Новая федэральная канстытуцыя 29.5.1874 (дзейнічае і цяпер) узмацніла федэральную ўладу і развіла дэмакр. ўстановы; ад дзяржавы аддзелена царква, праведзена секулярызацыя (пазбаўленне ад непасрэднага ўплыву духавенства) грамадскага, паліт., прыватнага жыцця і адукацыі на ўзор герм. *«культуркампфу»*. У 1888 узнікла С.-д. партыя Ш., якая стала адной з вядучых паліт. партый краіны. Як нейтральная дзяржава Ш. служыла прытулкам для многіх паліт. эмігрантаў, у т.л. для Т.*Касцюшкі*, у канцы 19 — пач. 20 ст. — рас. сацыял-дэмакратаў, у т.л. бальшавікоў. У 1-ю сусв. вайну Ш. прытрымлівалася поўнага нейтралітэту, які потым пацвердзіў *Версальскі мірны дагавор 1919*. Пасля вайны ў краіне (Жэнева) размяшчалася кіраўніцтва *Лігі Нацый* (Ш. ўступіла ў яе ў 1920), дзейнічаў *Бернскі інтэрнацыянал* (1919—23), адбыліся *Лазанская канферэнцыя 1922—23, Лакарнская канферэнцыя 1925, Жэнеўская канферэнцыя 1927, Жэнеўскія канферэнцыі па раззбраенні 1932—35, Мантро канферэнцыя 1936*, працавала *Нансенаўская міжнародная арганізацыя па справах бежанцаў*. У пач. 2-й сусв. вайны Ш. пацвердзіла свой нейтралітэт, але з 1940 змушана была прыстасоўвацца да ням.-фаш. «новага парадку» ў акупіраванай Еўропе. Швейц. банкі прымалі нарабаваныя герм. нацыстамі ў яўрэяў грошы. Пасля вайны Ш. з-за свайго нейтральнага статусу не ўступіла ў ААН, але ўвайшла ў яе спецыялізаваныя культ., эканам. і гуманіт. арг-цыі. Тут былі прыняты *Жэнеўскія канвенцыі 1949*. 1.8.1975 Ш. падпісала *Заключны акт Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе*. У Ш. адбыліся *Жэнеўскія нарады 1954—59, Жэнеўская нарада па ўрэгуляванні лаоскага пытання*, прыняты *Жэнеўскія пагадненні 1988* па Афганістане. Адначасова Ш. інтэгравалася ў некат. еўрап. эканам. і паліт. структуры. Ва ўнутрыпаліт. жыцці краіны важную ролю адыгрываюць рэферэндумы. У

Да арт. **Швейцарыя**. Сярэдневяковы малюнак, які сімвалізуе Швейцарскі саюз і далучэнне да яго кантона Берн (1353). У цэнтры — сімвалічная выява «клятвы ў Руце», якая, паводле легенды, дала пачатак зараджэнню сучаснай Швейцарыі — «вечнаму саюзу» 3 лясных кантонаў (1291).

1981 швейц. жанчыны ўраўнаваны ў правах з мужчынамі. У 1990-я г. дыскусіі ў грамадстве аб ролі Ш. ў праследаванні яўрэяў у 2-ю сусв. вайну прывялі да ўтварэння ў краіне шэрагу дабрачынных фондаў па дапамозе ахвярам *халакосту*. Для ўнутрыпаліт. сітуацыі характэрна стабільнасць у расстаноўцы паліт. сіл. З 1953 краінай нязменна кіруюць кааліцыі Радыкальна-дэмакр. партыі Ш. (РДПШ), Хрысц.-дэмакр. партыі Ш. (ХДПШ), С.-д. партыі Ш. (СДПШ) і Дэмакр. саюза цэнтра (ДСЦ), якія маюць большасць у нац. (80%) і кантанальных парламентах. 12.12.1997 Ш. падпісала рамачнае пагадненне з НАТО па праграме *Партнёрства дзеля міру*. Ш. — чл. ААН (з 2002), Савета Еўропы (з 1963), Сусв. банка (з 1992) і інш. міжнар. арг-цый. У краіне размешчаны розныя міжнар. арг-цыі і ўстановы, у т.л. *Міжнароднае бюро міру, Міжнародная арганізацыя працы, Міжпарламенцкі саюз, Еўрапейская эканамічная камісія ААН*, і інш., праводзяцца многія міжнар. канферэнцыі, у т.л. сусв. эканам. форумы ў Давосе. Дыпламат. адносіны з Рэспублікай Беларусь устаноўлены 10.2.1992.

Палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі. РДПШ, ХДПШ, СДПШ, ДСЦ, Ліберальная партыя Ш., Свабодная дэмакр. партыя, Швейц. нар. партыя, Партыя працы і інш. Прафс. рух узначальвае Аб'яднанне швейц. прафсаюзаў.

Гаспадарка. Ш. — высокаразвітая індустр. краіна з інтэнсіўнай с.-г. вытв-сцю, адзін з гал. у свеце фін. і банкаўскіх цэнтраў. Валавы ўнутр. прадукт (ВУП) у 2001 склаў 226 млрд. дол., 31,1 тыс. дол. на 1 чал. (4-е месца ў свеце). На долю прам-сці прыпадае 26,5% ВУП, сельскай гаспадаркі — 2%, сферы паслуг — 71,5%. Для прамысловасці характэрна вытв-сць высакая-

Да арт. **Швейцарыя**. Бітва пры Земпаху 1386.

касных і навукаёмістых відаў прадукцыі з арыентацыяй на экспарт. Гал. галіна прам-сці — машынабудаванне і металаапрацоўка. Вытв-сць высокадакладных станкоў, у т.л. з праграмным кіраваннем (2% сусв. вытв-сці, 87% экспартуецца, 2001), турбін, электраматораў, суднавых рухавікоў, тэкст. абсталявання, вымяральных прылад (Цюрых, Вінтэртур, Бадэн, Жэнева, Базель). Ш. — вядомы ў свеце вытворца гадзіннікаў (95% экспартуецца). Асн. цэнтры: Біль, Ла-Шо-дэ-Фон, Ле-Локль, Жэнева. Найб. фірмы «Амега», «Своч», «Лангендорф» і інш. Электраэнергетыка грунтуецца пераважна на мясц. гідраэнергарэсурсах. Выпрацоўка электраэнергіі 67,4 млрд. кВт·гадз (2000), у т.л. $^2/_3$ на ГЭС, $^1/_3$ на АЭС. Каляровая металургія прадстаўлена вытв-сцю алюмінію з імпартуемай сыравіны (Штэг, Мартыны-Віль) і рафінаваннем свінцу (8 тыс. т, 2000). Развіта хім. (вытв-сць фарбавальнікаў, валокнаў, пластмас) і хім.-фармацэўтычная прам-сць (Базель, Фісп, Берн). Швейцарскія фармацэўтычныя кампаніі «Навартыс» і «Рашэ» ўваходзяць у лік 5 асн. сусв. вытворцаў медыкаментаў. З галін лёгкай прам-сці вылучаюцца тэкст., у т.л. баваўняная (Санкт-Гален) і шаўковая (Цюрых, Базель), трыкат. (Цюрых), швейная (Жэнева, Берн, Лазана, Цюрых і інш.). У харч. прам-сці экспартнае значэнне маюць швейц. сыры, шакалад, канцэнтраты і інш. Вытв-сць сыру 146,3 тыс. т, сметанковага масла 38,5 тыс. т (2000). Развіты дрэваапр., паліграф., цэментавая прам-сць, ювелірная справа. Здабыча каменнай солі і сыравіны для вытв-сці буд. матэрыялаў. Асн. галіна *сельскай гаспадаркі* — жывёлагадоўля, пераважна малочнага кірунку. Ворныя землі займаюць каля 10% тэр., сенажаці і пашы — 16%. Пагалоўе (млн. галоў, 2001): буйн. раг. жывёлы — 1,61, свіней —1,56, авечак — 0,46, коз — 0,07, птушак — 6,66. Вытв-сць (тыс. т, 2000) малака — 528,9, мяса — 412,6, у т.л. свініны — 224,9. Гал. збожжавая культура — пшаніца (50% пл., збор 520 тыс. т, 2001). Вырошчваюць таксама ячмень, жыта, авёс, кукурузу (222 тыс. т), цукр. буракі, бульбу. Вінаградарства. Садоўніцтва (збор яблыкаў 164 тыс. т, 2001). Даўж. чыгунак 5 тыс. км (усе электрыфікаваныя), аўтадарог з цвёрдым пакрыццём 71,6 тыс. км. Шмат мастоў, тунэляў, віядукаў. Важныя тунэлі — Сен-Гатардскі, Лечбергскі, Сімплонскі. Аўтапарк налічвае 3,6 млн. машын, у т.л. 3,2 млн. легкавых. Ш. належыць 0,87% сукупнага сусв. танажу марскога флоту, судны якога прыпісаны да партоў інш. краін. Суднаходства па р. Рэйн і азёрах. Гал. парты: Базель, Цюрых, Лазана, Люцэрн. 4 міжнар. аэрапорты. Ш. мае дадатны гандл. баланс. Экспарт (78,1 млрд. дол., 2001) прадукцыі машынабудавання і металаапрацоўкі, у т.л. гадзіннікаў, хім. і хім.-фармацэўтычных вырабаў, харч. прадуктаў, тэкстылю і інш. Імпарт (77,1 млрд. дол., 2001) прадукцыі цяжкага машынабудавання, аўтамабіляў, паліва і інш. Асн. гандл. партнёры: краіны ЕС (65,8% экспарту і 77,7% імпарту), ЗША (12,4% і 7,1%). Гандл. абарот Беларусі з Ш. у 2001 склаў 45,7 млн. дол. Ш. — краіна развітога турызму. У 2000 краіну наведала 11,4 млн. замежных турыстаў. Даход ад турызму склаў 7,36 млрд. дол. Гал. курорты: Давос, Санкт-Морыц, Лугана, Бадэн, Лакарна. Грашовая адзінка — швейцарскі франк.

Да арт. **Швейцарыя**. Замак Шыльён.

Узброеныя сілы (2001). Уключаюць рэгулярныя ўзбр. сілы 3,6 тыс. чал. (толькі кадравы састаў); рэзерв 351,2 тыс. чал. і ваенізаваныя фарміраванні — сілы грамадскай абароны 280 тыс. чал. Галоўнакамандуючы — прэзідэнт. Камплектаванне паводле прызыву. Рэгулярныя ўзбр. сілы складаюцца з сухап. войск, ВПС і Войск ППА. У сухап. войсках (пры адмабілізацыі) 320,6 тыс. чал., 556 танкаў, 435 баявых машын пяхоты, 319 баявых разведвальных машын, 1180 бронетранспарцёраў, 558 самаходных гаўбіц, 1785 мінамётаў, 3063 пускавыя ўстаноўкі процітанк. кіроўных ракет, 60 верталётаў, 11 патрульных катэраў і інш. У ВПС і Войсках ППА (пры адмабілізацыі) 32,6 тыс. чал., 171 баявы самалёт. У склад тактычных часцей і падраздзяленняў уваходзяць знішчальныя, разведвальныя, трансп., вучэбна-трансп. і верталётная авіяц. эскадрыллі, зенітныя ракетныя батарэі.

Асвета. Сістэма адукацыі Ш. ўключае дашкольныя ўстановы, агульнаадук. і прафес.-тэхн. школы, сярэднія спец. і вышэйшыя навуч. ўстановы. У Ш. няма адзінага міністэрства адукацыі і, адпаведна, адзінай школьнай сістэмы. Кожны з яе кантонаў мае сваю сістэму асветы, падобную да сістэмы Германіі, Францыі ці Італіі. Абавязковае навучанне дзяцей ад 6—7 да 15—16 гадоў. Існуюць дзярж. і прыватныя школы. Асноўная (пач.) школа 7—9-гадовая і складаецца з 2 ступеней. На 1-й ступені ўсе вучні атрымліваюць агульнаадук. падрыхтоўку. У старэйшых класах пач. школы даюць і спец. прафес. падрыхтоўку для паступлення ў прафес.-тэхн. школы, рамесныя вучылішчы ці работы ў сельскай гаспадарцы. Сярэдняя школа на базе 4—6 класаў пач. школы, мае 2 ступені — малодшую (4-гадовая прагімназія, якая дае права паступаць у сярэднюю агульнаадук. школу старэйшай ступені) і старэйшую (4—5-гадовая гімназія, якая мае 3 аддзяленні: класічнае, сучасных моў і прыродазнаўча-матэм.; дае права паступаць ва ун-ты і тэхн. ВНУ). Існуюць 2 тыпы сярэдніх школ — агульнаадукацыйныя і спецыялізаваныя. У 2002/03 навуч. г. ва ўсіх тыпах школ Ш. навучалася больш за 900 тыс. школьнікаў, у т.л. каля 250 прыватных школ (каля 100 тыс. дзяцей). Працягласць навучання ў ВНУ 3—5, на некаторых ф-тах 6 гадоў. У сістэму вышэйшай адукацыі ўваходзяць 7 ун-таў: Базельскі (з 1460), Лазанскі (з 1537), Жэнеўскі (з 1559), Цюрыхскі (з 1833), Бернскі (з 1834), Фрыбурскі (з 1889), Неўшатэльскі (з 1909), федэральныя вышэйшыя політэхн. школы ў Цюрыху і Лазане і інш. У 2002/03 навуч. г. ў ВНУ навучалася больш за 40 тыс. студэнтаў. Найбольшыя б-кі: Публічная Базельскага ун-та, Швейцарская нац. ў Берне, ун-таў у Цюрыху, Жэневе, Лазане. Музеі: гіст., маст., натуральнай гісторыі ў Берне; гіст., этнаграфічны, Публічны маст. збор, сучаснага мастацтва, ант. мастацтва ў Базелі; гіст., сучаснага мастацтва, этнаграфіі ў Жэневе; гісторыі медыцыны, антрапалагічны, заалагічны ў Цюрыху; мастацтва і гісторыі ў Фрыбуры і інш. Навук. даследаванні праводзяцца ў Жэнеўскім нац. ін-це, швейцарскіх прыродазнаўчанавуковым, фіз., батанічным і інш. навук. т-ваў, на кафедрах ун-таў.

Друк, радыё, тэлебачанне. У 2000 у Ш. выдавалася каля 230 газет і інш. перыяд. выданні. Найб. тыражныя газеты на ням. мове — «Blick» («Погляд», з 1959), «Tages Anzeiger Zürich» («Штодзённы цюрыхскі агляд», з 1893), «Neue Zürcher Zeitung» («Новая цюрыхская газета», з 1870), «Berner Zeitung» («Бернская газета», з 1844), «Basler Zeitung» («Базельская газета», з 1977); на франц. мове — «La Tribune de Genève» («Жэнеўская трыбуна», з 1879), «Le Matin» («Раніца», з 1862), «Le Temps» («Час», з 1998); на італьян. мове — «Corriere del Ticino» («Навіны Тычына», з 1890). Нац. інфарм. агенцтва — Швейц. тэлегр. агенцтва (з 1894). Радыёвяшчанне з 1923. Тэлебачанне з 1953. Агульнанац. вяшчанне на 4 афіц. мовах вядзе грамадская Швейц. тэлерадыёвяшчальная

карпарацыя (мае 18 радыёстанцый і 7 тэлеканалаў). Дзейнічаюць каля 60 прыватных рэгіянальных і мясц. радыёстанцый і 50 тэлеканалаў. Ліцэнзаванне і кантроль за дзейнасцю радыёстанцый і тэлеканалаў ажыццяўляюць Федэральнае бюро сувязі і Незалежная адміністрацыя па разглядзе скаргаў.

Літаратура. Як самаст. л-ра склалася ў 14—15 ст. Сучасная л-ра развіваецца на ням., франц., італьян. і рэтараманскай мовах. Літаратура на нямецкай мове бярэ пачатак у куртуазнай паэзіі Конрада Вюрцбургскага (13 ст.), паданнях пра Вільгельма Тэля і Арнальда Вінкельрыдэ, рэліг. прозе містыкаў (Г.Зойзе, Э.Штагель; 14 ст.), лірыцы мінезінгераў (І.Хадлаўб, Б.Штайнмар; 13—14 ст.) і інш. У 14—16 ст. пашырылася камічна-дыдактычная паэзія (Г.Вітэнвайлер). Асн. літ. жанрам эпохі Рэфармацыі была гіст. драма (П.Генгенбах, Г.Залат, Н.Мануэль), баявыя песні ствараў У.*Цвінглі*. У 17 ст. вылучылася алегарычная і дыдактычная паэзія І.К.Вайсенбаха, І.В.Зімлера, асветніцкая А. фон *Галера*, эпіграмы І.Гроба, сатыр. проза Я.Гравісета, эстэт. і крытычныя працы І.Я.Бодмера, І.Я.Брайтынгера. У 2-й пал. 18 ст. развівалася гіст.-асветніцкая паэзія І.К.Лафатэра, дыдактычная проза І.Г.*Песталоці*, ідыліі С.Геснера, мемуары і літ.-крытычная проза У.Брэкера. Сярод прадстаўнікоў сентыменталізму — І.В.Відман, І.Г.Заліс-Зевіс, асветніцкага рэалізму — У.Хегнер, Д.Хес, гіст. прозы — І.Готхельф, Г.Цшоке, пачынальнікаў рамант. л-ры — Г.*Келер*, І.Р.Віс, І.М.Устэры. У 2-й пал. 19 ст. крытычную плынь у л-ры прадстаўлялі К.Ф.*Маер*, Келер, пачынальнікам рэалізму і пазітывізму быў Я.Штуц. Пошук эстэт. ідэалу ў мінуўшчыне характэрны для паэзіі К.*Шпітэлера*, Г.Лёйтхальда. У 1-й пал. 20 ст. вылучаліся гуманіст. творы Р.*Вальзера*, рэаліст. традыцыі ў паэзіі і прозе прадоўжыў А.Цолінгер. У творчасці Ф.*Дзюрэнмата*, М.*Фрыша* спалучаліся мадэрнісцкія і рэаліст. тэндэнцыі. У 2-й пал. 20 ст. развівалася дэтэктыўная л-ра (Ф.Глаўзер, Дзюрэнмат), сац.-крытычная проза В.М.Дыгельмана, Х.Лёчэра, Ю.Федэршпіля, О.Штайгера, песенная паэзія Э.Буркарт, К.Марці. Вылучыліся псіхал. творы П.Бікселя, О.Ф.Вальтэра, А.Мушга, барочныя Г.Бургера, Г.Шпета, гратэскавыя Ю.Амана, Ю.Ледэраха. Традыцыі нар. паэзіі ў лірыцы Э.Гомрынгера, Д.Рота, драм. творах Ц. фон Аркса. Майстрам парабалы праявіў сябе Г.Бэш. У 1990-я — пач. 2000-х г. у л-ры плённа працавалі С.Блатэр, Б.Брэхбюль, П.Гандэльман, Л.Б.Зутэр, А.Капус, Д.Фрынглі, Т.Хюрліман і інш. Літаратура на французскай мове (рамандская) набыла самаст. значэнне ў познім сярэдневякоўі. Найб. вядомы пераклады і апрацоўкі Ж.Сервіёна, паэзія А. дэ Грансона (14 ст.), проза Ж.Баньёна (15 ст.), гіст. творы Ф.Банівара, А.П. дэ Рыва, драмы-маралітэ Т.Маленгра, пратэстанцкая паэзія Б.Ары, М.Разэ (16 ст.), палемічныя творы Ж.*Кальвіна*. У 17 ст. Ж.Флурнуа стварыў першы арыгінальны швейц. раман на франц. мове. У 18 ст. жанр асветніцкага рамана прадстаўляў І. дэ Шар'ер. У 19 ст. рамант. традыцыі выявіліся ў працах па гісторыі культуры С. дэ Сісмандзі, прозе А.Башлена, Р.Тэпфера, паэзіі Ж.Д.Аліўе, Э.Эгжыса. У канцы 19 — пач. 20 ст. рэаліст. характар мела творчасць А.Варнеры, Ф.Гадэ, Ф.Манье, Э.Рода, Э.Тавана, А. дэ Шамбр'е і інш.; пачаткі сімвалізму ў паэзіі Л.Дзюшазаля. У 1-й пал. 20 ст. вядомасць набыла проза Л.Бопа, Б.Валатона, Ш.Ф.Ландры, Ш.Ф.Рамю, паэзія П.Жырара, Р.Л.П'яшо, А.Шпіса, драматургія В.Раселя, П.Шавана і інш. У 1980-я — пач. 2000-х г. вылучаліся паэт і празаік Ж.Меркантон, паэт і эсэіст П.Жакатэ, празаікі Ж.Альда, К.Бій, І.Велан, А.Каэн, М.Шапа, крытык і эсэіст Ж.Старобінскі і інш. Літаратура на італьянскай мове ўзнікла ў 19 ст. і развіваецца пераважна ў кантоне Тэсін. Яе пачынальнікі — Дж.Мот, П.П'ера, Дж.Цопі і інш. У 20 ст. яе традыцыі развівалі паэт і празаік Ф.К'еза, празаікі Дж.Баналумі, П.Б'янконі, А.Джэні, А.Несі, П.Сканцыяні, Ф.Філіпіні, паэты Дж.Арэлі, Ф.Менгіні, Р.Фазані і інш. Літаратура на рэтараманскай мове ўзнікла ў 16 ст. (Дж.Траверс). Новы імпульс набыла ў эпоху рамантызму (19 — пач. 20 ст.; апрацоўкі фальклору і творчасць пісьменнікаў Ф.Аспермунта, Ф.Каматыяса). Грамадз. матывы ўласцівы паэзіі Дж.К.Муата, публіцыстыцы Дж.Ф.Кадэраса, З.Паліёпі. У 19—20 ст. працавалі празаікі Дж.М.Най, Дж.Фантана, паэты Э.Бецола, П.Лансель, А.Пеер, паэты і празаікі К.Бірт, Р.Карач, А.Кафліш, К.Мані, драматургі Т.Мурк, І.Семадэні і інш. На бел. мову асобныя творы В.Гесэ, Дзюрэнмата, Дыгельмана, Келера, Мушга пераклалі Я.Купала, Л.Баршчэўскі, М.Навіцкі, В.Русецкі, В.Сёмуха, М.Сяднёў.

Архітэктура. У 1 ст. да н.э. склаліся буйныя цэнтры рым.-кельцкай культуры, створаны фартыфікацыйныя збудаванні, рэгулярна спланаваныя гарады з прамавугольнай сеткай вуліц, храмамі, форумамі, т-рамі, загарадныя вілы, аздобленыя жывапісам і мазаікай (Цюрых, Жэнева). У раннім сярэдневякоўі ўзводзілі будынкі, характэрныя для меравінгскага мастацтва (5—8 ст.) і *каралінгскага адраджэння* з захаваннем мясц. традыцый: баптыстэрый у Рыва-Сан-Вітале, зальная царква ў Раменмацье, манастыр у Санкт-Галене (уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*). Пабудовы раманскага стылю ў

Да арт. **Швейцарыя**. Кляштар Санкт-Іаган у Мюнстэры.

паўн. і цэнтр. раёнах узніклі пад уплывам нямецкім, у Жэневе і Лазане — французскім, на Пд — італьянскім; яны адметныя нязначнай расчлянёнасцю аб'ёмаў, стрыманым скульпт. дэкорам (сабор Нотр-Дам у Лазане). Сярод раманска-гатычных помнікаў базілікі без трансепта і вежаў у Базелі, Цюрыху, Берне, кляштар Санкт-Іаган у Мюнстэры, умацаванні ў Базелі, Берне і інш. Плошчы гарадоў забудоўвалі 2- і 3-павярховымі дамамі з высокімі дахамі, трохвугольнымі франтонамі, адкрытымі

Да арт. **Швейцарыя**. Інтэр'ер сабора ў Лазане. 13 ст.



Да арт. **Швейцарыя**. Гадзіннікавая вежа ў Берне. 15 ст.

аркадамі. На ўзгорках і высокіх берагах рэк і азёр узводзілі замкі феадалаў (замак Шыльён на беразе Жэнеўскага воз., 12—15 ст.). Рысы рэнесансу выявіліся ў арнаментальным дэкоры, ордэрных матывах, выразнай кампазіцыі фасадаў будынкаў (фасад сабора ў Лугане). На мяжы 16—17 ст. сфарміраваўся тып рэнесансавага загараднага і гар. асабняка. Грамадскія будынкі і прыватныя дамы часта спалучалі рэнесансавыя і гатычныя рысы (прэфектура ў Фрыбуры), іх фасады аздаблялі размалёўкай («Рыцарскі дом» у Шафгаўзене з размалёўкай Т.Штымера). Тыповая для швейц. горада 2—3-павярховая ратуша мела вежу з гадзіннікам, накрыта высокім дахам (у Базелі, Цюрыху, Люцэрне і інш.). У культавай архітэктуры 17—18 ст. сцвердзілася барока (сабор у Санкт-Галене, замак Штокальпер у Брыгу). У 18—19

Да арт. **Швейцарыя**. Н.М а н у э л ь. Суд Парыса. 1520—25.

ст. пашыраны класіцызм (ратуша ў Неўшатэлі, асабняк «дэ Мюзік», Хайлігайсткірхе ў Берне). У некат. гарадах грамадскія будынкі захоўвалі агульныя рысы з сял. і бюргерскімі дамамі, мелі высокія дахі, адкрытыя лесвіцы. Сярод эклектычных пабудоў гасцініца «Палас» у Го, гіст. музей Берна ў Берне. Для архітэктуры 1-й пал. 20 ст. характэрны зварот да новых матэрыялаў, маляўнічай планіроўкі вуліц з невял. 1— 4-кватэрнымі дамамі, якія арганічна ўпісваліся ў навакольны ландшафт. Архітэктар Р.Маяр практыкаваў буд-ва з маналітнага жалезабетону, стварыў тып жалезабетоннага арачнага моста аблегчанай канструкцыі і сістэму жалезабетонных бязбэлечных перакрыццяў. У 1930-я г. на сцвярджэнне рацыяналізму паўплывалі работы Ле Карбюзье (творчасць Х.*Меера*). Архітэктура 2-й пал. 20 ст. адметная стрыманасцю, прастатой, эканамічнасцю, забудовай горных схілаў тэраснымі дамамі (у Цугу, жылы комплекс Хален каля Берна), турыст. комплексамі. Жылыя кварталы буйных гарадоў размяшчаюць сярод зялёных масіваў, удалечыні ад магістралей і прамысл. аб'ектаў (пас. Летцыграбен каля Цюрыха), набыло пашырэнне кантрастнае спалучэнне рознавялікіх будынкаў (жылы комплекс Ле-Ліньён у Жэневе). Адметнасць швейц. архітэктараў — высокі прафесіяналізм, якасная і старанная аддзелка дэталей, творчае вырашэнне праблем горадабудаўніцтва.

Выяўленчае мастацтва. Маст. культура Ш. развівалася ў цеснай сувязі з мастацтвам Францыі, Германіі і Італіі пры захаванні нац. самабытнасці. Найб. стараж. помнікі — палеалітычныя выявы жывёл, гравіраваныя вырабы з косці, звонападобныя кубкі эпохі бронзы. Высокі ўзровень мелі творы гальштацкай і латэнскай археал. культур (бронз. зброя і посуд, залатыя змее- і літаўрападобныя засцежкі-фібулы, вёдры-сітулы, бранзалеты з расл. і зааморфным арнаментам, пахавальныя каменныя стэлы). У сярэдневяковы вядучай была кніжная мініяцюра з цэнтрам у Санкт-Галене. У раманскім стылі — рэльефы сабораў у Куры, Мюнстэры і інш. У манум. жывапісе адраджаліся ант. прыёмы, засн. на зрокавай ілюзіі (фрэскі кляштара Санкт-Іаган у Мюнстэры, 9 ст.). У 13—14 ст. развіваліся гатычная манум. скульптура («Апостальскія вароты» сабора ў Лазане), фрэскавы жывапіс (царква Сан-Б'яджа каля Белінцоны, каля 1390), вітраж (царква ў Кёнігсфельдэне, каля 1325—30), размалёўкі прыватных дамоў і замкаў на тэмы палявання, турніраў, баляў (у замку Шыльён, 1342). Буйны майстар станковага жывапісу 15 ст. — К.*Віц*. У Ш. працавалі многія мастакі ням. Адраджэння (А.Дзюрэр, Г.Бальдунг, Г.Гольбейн Малодшы). З маст. культурай Германіі звязана творчасць буйных майстроў Ш. пач. 16 ст. Н.Мануэля, У.Графа, Х.Лея Малодшага. Шырока былі развіты кнігадрукаванне і маст. рамяство. У жывапісе класіцызму вылучаліся пастэлі Ж.Э.*Ліятара*, партрэты А.Графа. Пад уплывам Асветніцтва і ранняга рамантызму склаліся ідэйныя асновы буйнога прадстаўніка маст. жыцця краіны канца 18 — пач. 19 ст. І.Г.Фюслі (карціны на тэмы твораў Гамера, Дантэ, У.Шэкспіра, ням. рамантыкаў). У сярэдзіне 19 ст. тэмы нар. жыцця ўвасаблялі жывапісцы А.Анкер і Б.Вацье, вясковы і гар. пейзаж — А.*Каламам*. Творчасць многіх мастакоў 2-й пал. 19—20 ст. звязана з інш. еўрап. краінамі, дзе яны набывалі маст. адукацыю (А.*Бёклін* і інш.); графік Т.А.Стэйнлен і жывапісец Ф.*Валатон* увайшлі ў франц. маст. школу. У духу сімвалізму тэмы нац. гісторыі і фальклору трактаваў Ф.*Ходлер*. У 1914—18 зарадзіўся дадаізм. Маст. установкам ням. экспрэсіянізму блізкая ранняя творчасць П.*Клее*. У скульптуры ў духу абстракцыянізму працавалі Э.Арп і С.Тойбер-Арп. Сусв. прызнанне атрымала творчасць жывапісца, графіка і скульптара А.Джакамеці. Прадстаўнік прагрэс. кірунку сучаснага мастацтва — Х.*Эрні*. Для нар. мастацтва характэрны разьбяныя драўляныя вырабы, кераміка, ткацтва, выцінанкі, вырабы са скуры і металу. Высокага ўзроўню дасягнуў дызайн (вытв-сць гадзіннікаў, мэблі, электрапрыбораў, шкла, машынных карункаў). У 1776 засн. Т-ва мастацтваў, у 1856 — Т-ва мастакоў, скульптараў і архітэктараў Ш.

Музыка. На характары швейц. музыкі адбіўся поліэтн. склад насельніцтва. У нар. музыцы 13—16 ст. развіваліся гіст., патрыят. песні, песенны жанр альпійскіх горцаў — ёдль, пастухоўскія найгрышы. Сярод нар. інструментаў: свістулька, альпійскі ражок. Прафес. музыка зарадзілася каля 10 ст. як царк. (секвенцыі манахаў манастыра ў Санкт-Галене,

Да арт. **Швейцарыя**. Ж.Э.Л і я т а р. Партрэт Мэры Ганінг, графіні Ковентры. Каля 1754.

буйнога муз. цэнтра сярэдневяковай Еўропы). У 13—14 ст. пашырылася свецкая музыка *мінезінгераў* і *трубадураў*. З 14 ст. развіваецца нац. муз. культура. У 16 ст. сярод муз. дзеячаў тэарэтык і вучоны-гуманіст Гларэан і майстар царк. поліфанічнай музыкі Л.Зенфль. У 17 ст. ў развіцці прафес. мастацтва вял. роля належала аб'яднанням аматараў музыкі Калегіум музікум (першы створаны ў Цюрыху). У 18 ст. пашырыліся свецкія муз. жанры, у т.л. опера-буфа, зінгшпілі і інш. У 19 ст. стваралiся пеўчыя хар. т-вы, школы, прафес. і аматарскія хары, сімф. аркестры (Цюрыхскі, 1862), кансерваторыі, выдадзены першы фалькл. зборнік (1805). Для муз. мастацтва пач. 20 ст. характэрна нац. дыферэнцыяцыя па

моўных рэгіёнах. У 1920—30-я г. для муз. твораў характэрны рысы позняга рамантызму і імпрэсіянізму, у канцы 1940-х г. адчувальны ўплывы авангардызму, цікавасць да джазу і серыйнай тэхнікі. Сярод муз. дзеячаў 19—20 ст.: кампазітары Ф.Андрэ, Э.Блох, Г.Губер, Э.Жак-Далькроз (педагог, заснавальнік сістэмы рытмічнага выхавання), Г.Зутэрмейстэр, Ф.Мартэн, О.Шок; дырыжоры Э.Ансермэ, Э.Апія, С.Варвізо, П.Захер; арганісты К.Зен, К.Функе, піяністы Э.Фішэр, П.Баўмгартнер, спявачкі Л.Дэла Каса, Э.Матыс; музыказнаўцы Э.Курт, К.Неф. У Ш. дзейнічаюць: оперныя т-ры ў Берне і Цюрыху, Муніцыпальны т-р у Базелі; оперныя трупы ў Базелі, Берне, Цюрыху і інш.; каля 10 сімф. аркестраў, у т.л. Раманскай Швейцарыі (з 1918), камерна-інстр.; хар. калектывы, у т.л. Цюрыхскі Бахаўскі хор; кансерваторыі ў Берне, Лазане, Жэневе, Цюрыху, Пеўчая школа і Акадэмія музыкі ў Базелі. У

Да арт. **Швейцарыя**. А.Джакамеці. Дыега. 1951.

Ш. знаходзяцца міжнар. муз. арг-цыі, у т.л. музыказнаўчае т-ва ў Базелі, Еўрап. асацыяцыя муз. фестываляў у Жэневе і інш. Муз. жыццё Ш. каардынуе Швейц. муз. савет (1964).

Тэатр. Тэатр. мастацтва Ш. развівалася адначасова на франц., ням. і італьян. мовах. У сярэднія вякі ўзніклі нар. тэатр. паказы. Ставіліся містэрыі і маралітэ, пазней фастнахтшпілі, маскарадныя шэсці, карнавальныя гульні. У 1512 у Альтдорфе пастаўлена швейц. п'еса на ням. мове «Гульня пра Тэля», у 1514 у Цюрыху — першая швейц. драма. У 1801 у Санкт-Галене створаны нямецкамоўны прафес. т-р. Пасля 1848 узніклі швейц. трупы, якія ставілі паказы на ням. і франц. мовах у Лазане, Жэневе, Берне і інш. З 20 ст. тэатр. жыццё сканцэнтравана ў Берне (вядучы т-р Ш. «Шаўшпільгаўз» засн. ў 1908 як «Пфаўэнтэатэр»; «Атэлье-тэатр»), Лазане («Піці-Шэн», «Бальё»), Цюрыху; існуюць таксама т-ры ў Люцэрне, Базелі. У іх рэпертуары класічныя і сучасныя творы, п'есы швейц. драматургаў Ф.Дзюрэнмата, А.Жэры, Р.Маракса, М.Фрыша і інш. Навізной тэматыкі і арыгінальнасцю маст. вырашэнняў вылучаюцца пастаноўкі невял. аматарскіх тэатраў. Сярод найбуйнейшых тэатр. дзеячаў О.Вельтэрлін, Х.Гнекаў, Л.Лінтберг, Т.Ота, О.Эберле і інш. У Лазане праводзяцца міжнар. тэатр. фестывалі.

Кіно. Першая нац. кінакампанія, засн. ў 1918 Л.Томбе, здымала пераважна прыгодніцкія і камічныя фільмы. У 1920-я г. развівалася франкамоўная (рэж. Ж.Беранжэ, Ж.Брашэ, А.Паршэ) і нямецкамоўная (рэж. Э.Гардэр) кінематаграфія. У 1924 засн. кінакампанія «Прэзенс», якая ў 1930-я г. экранізавала творы Г.Келера і І.Готхельфа. Сярод найб. значных фільмаў «Стралок Віпф» (1938, рэж. Л.Лінтберг, Г.Галер), «Апошні шанц» (1945), «Цараванне Мато» (1947, рэж. абодвух Лінтберг), «Батрак Улі» (1954), «Улі-арандатар» (1956, рэж. абодвух Д.Шнідэр). Фільмы здымалі таксама замежныя рэж. Л.Вайду, Л.Каменчыні, К.Гофман, Э.Цісэ, Ф.Цынеман. Развівалася навук.-папулярнае і дакумент. кіно (рэж. А.Керн). У франкамоўным кінематографе да сярэдзіны 1960-х г. пераважалі дакумент. фільмы (рэж. Ш.Ж.Дзюванель, Г.Брант), іграўвыя стужкі здымалі Н.Жэснер, Паршэ, К.Рудан, Ф.Сюрваль. Здымаліся таксама фільмы на італьян. мове (рэж. А.Керн, Б.Сальдзіні). Шматмоўнасць насельніцтва і перавага ў пракаце замежных фільмаў адмоўна адбіваліся на нац. кінавытворчасці. У канцы 1960 — пач. 1970-х г. кінематограф Ш. адышоў ад жывапісна-турыстычных і меладраматычных стэрэатыпаў. Склаўся сац.-псіхал. кірунак: «Вучні» (1964, рэж. А.Танер), «Чацвёра з іх» (1967, рэж. К.Шамп'ён, Ж.Сандас, Ф.Росер, І.Ерсэн), «Гашыш» (1968), «Каморнікі» (1972, рэж. абодвух М.Сутэр), «Запрашэнне» (1973), «Каруначніца» (1977, сумесна з Францыяй і ФРГ, рэж. абодвух К.Гарэта). Вытанчанай кінамовай вылучаюцца фільмы М.Імгофа («Лодка поўная», 1981), Д.Шміда («Галубка», 1974; «Цень анёла», 1976; «Бярэзіна, або Апошнія дні Швейцарыі», 1999). Сярод фільмаў 1990-х г. «Зялёны Генрых» (рэж. Т.Керфер), «Мары пра вялікую блакітную ваду» (рэж. К.Заўэр), «Злыя хлопцы» (рэж. Б.Моль), «Спякотна—халодна» (рэж. М.Фішэр), «Бацька, дарагі бацька» (рэж. Л.Губер), «У чаканні Мікеланджэла» (рэж. К.Форстэр). Вядучыя рэж. А.Ф.Амігуэ, Г.Баўэр, Ф.Дабіні, Р.Дзіндо, Керфер, Б.Куэрт. Праводзяцца міжнар. кінафестывалі дзіцячых фільмаў у Фрыбургу, маст. фільмаў у Лазане, Лакарна, Ньёне і інш.

Літ.: Драгунов Г.П. Швейцария: история и современность: (Очерк новейшей истории). М., 1978; Ягож. Чертов мост: По следам Суворова в Швейцарии. М., 1995; Павлова Н.С., Седельник В.Д. Швейцарские варианты: Лит. портреты. М., 1990; Альпы и свобода: Швейцарские писатели о своей стране, 1291—1991: Пер. с нем., фр., итал. М., 1992.

П.І.Рогач (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *У.Я.Калаткоў* (гісторыя), *В.А.Юшкевіч* (узброеныя сілы), *Л.У.Языковіч* (асвета), *Л.А.Фядотаў* (друк, радыё, тэлебачанне), *Л.П.Баршэўскі* (літаратура), *Я.Ф.Шунейка* (выяўленчае мастацтва, архітэктура), *Г.У.Шур* (кіно).

ШВЕ́ЙЦЭР (Schweitzer) Альберт (14.1.1875, г. Кайзерсберг, Францыя — 4.9.1965), нямецкі і франц. рэліг. філосаф, культуролаг, музыказнавец, арганіст, урач і місіянер. Д-р філасофіі (1899), тэалогіі (1900), медыцыны (1913). Ганаровы д-р шэрагу еўрап. і амер. ун-таў. Вучыўся ў Страсбурскім (1893—98, 1905—08) і Парыжскім (1898—99) ун-тах. У 1903—05 кіраўнік семінарыі св. Фамы ў Страсбуры. У 1913 заснаваў першую ў Экватарыяльнай Афрыцы бальніцу для мясц. насельніцтва (г. Ламбарэне, Габон), дзе працаваў (з перапынкамі) да канца жыцця. Выступаў з арганнымі канцэртамі ў Германіі, Швецыі, Вялікабрытаніі і інш. еўрап. краінах, вылучаўся віртуознай тэхнікай і глыбокім разуменнем прыроды арганнай музыкі, найперш твораў І.С.Баха. У працы «І.С.Бах» (1908) імкнуўся ацаніць яго творчасць з новых эстэт. пазіцый. Даследаваў гісторыю аргана. У цэнтры яго філас. поглядаў — праблема ўзаемадзеяння чалавека з божым і зямным светам. Прааналізаваўшы гісторыю рэлігій свету, прыйшоў да высновы, што хрысціянства — адзінае вучэнне, якое спалучае ў сабе разуменне недасканаласці зямнога і імкненне да пераўтварэння свету ў адпаведнасці з божай задумай. Асн. перавагу хрысц. вучэння бачыў у яго этычнай накіраванасці, якую лічыў асновай найвышэйшага тыпу духоўнасці («Хрысціянства і сусветныя рэлігіі», 1924). На яго думку, у аснове сапраўднай этыкі ляжыць прынцып «глыбокай пашаны да жыцця». Лічыў, што ў аснове жыццесцвярджальнага светапогляду ляжыць «перажыванне» свету, а не яго пазнанне, што рацыяналізм і веды прыводзяць да песімізму. Паводле Ш., еўрап. культура знаходзіцца ў глыбокім заняпадзе, што выяўляецца ў панаванні матэрыяльнага над духоўным, грамадства над індывідуумам і абумоўліваецца крызісам еўрап. светапогляду. Сцвярджаў, што выратаваць культуру можа толькі стварэнне па-філасофску абгрунтаванага светапогляду, які б спалучаў у сабе аптымізм і этыку «пашаны да жыцця» і быў накіраваны на духоўна-маральнае ўдасканаленне чалавека і грамадства («Культура і этыка», 1923). Аўтар прац «Тайна месіянізму і пакуты: Нарыс жыцця Хрыста» (1901), «Містыка апостала Паўла» (1930), «Праблема свету ў сучасным свеце»

(1954), «Гуманнасць» (апубл. 1966) і інш. Нобелеўская прэмія міру 1952.

Тв.: Рус. пер. — И.С.Бах. М., 1965; Письма из Ламбарене. 2 изд. Л., 1989; Благоговение перед жизнью. М., 1992; Упадок и возрождение культуры: Избранное. М., 1993; Жизнь и мысли. М., 1996; Мировоззрение индийских мыслителей: Мистика и этика. М., 2002.

Н.Г.Кісялёва.

ШВЕ́ЙЦЭР Міхаіл Абрамавіч (16.3.1920, г. Пенза, Расія — 2.6.2000), расійскі кінарэжысёр. Нар. арт. Расіі (1977). Нар. арт. СССР (1990). Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1944, майстэрня С.*Эйзенштэйна*). Паставіў фільмы: «Шлях славы» (1949, з Б.Бунеевым і А.Рыбаковым), «Чужая радня» паводле У.Цендракова (1956), «Мічман Панін» (1960), «Уваскрэсенне» паводле Л.Талстога (1960—62), «Залатое цяля» паводле І.Ільфа і Я.Пятрова (1968), «Уцёкі містэра Мак-Кінлі» паводле Л.Лявонава (1975), «Крэйцарава саната» (1987), «Паслухай, Феліні!..» (1993, з С.Мількінай); тэлефільмы «Маленькія трагедыі» паводле А.Пушкіна (1980), «Мёртвыя душы» паводле М.Гогаля (1984) і інш. Дзярж. прэмія СССР 1977.

ШВЕ́ЛЕР (ням. Schweller), металічная бэлька П-падобнага сячэння. Стальныя Ш. атрымліваюць пераважна пракаткай загатоўкі, Ш. з тонкімі бакамі — згінаннем паласы, Ш. з каляровых металаў і сплаваў — прасаваннем з выцісканнем праз фасонную адтуліну. Выпускаюцца Ш. некалькіх дзесяткаў тыпапамераў; адрозніваюцца па нумарах, якія паказваюць вышыню профілю ў сантыметрах (ад 5 да 40 см), з таўшчынёй сценкі 0,4—1,5 см.

ШВЕ́РНІК Мікалай Міхайлавіч (19.5.1888, С.-Пецярбург — 24.12.1970), савецкі дзярж. і паліт. дзеяч. Герой Сац. Працы (1958). Чл. Камуніст. партыі з 1905, яе ЦК (з 1925), канд. у чл. (1939—52, 1953—57), чл. (1952—53, 1957—66) Палітбюро (Прэзідыума) ЦК КПСС. У 1905—17 на парт. рабоце ў Пецярбургу, Мікалаеве і інш. Удзельнік грамадз. вайны. З 1921 на сав., парт. і прафс. рабоце. У 1946—53 старшыня Прэзідыума Вярх. Савета СССР, у 1953—56 старшыня ВЦСПС, з 1956 старшыня К-та парт. кантролю, з 1962 — Парт. камісіі пры ЦК КПСС.

ШВЕРЫ́Н (Schwerin), горад на Пн Германіі. Адм. ц. зямлі Мекленбург — Пярэдняя Памеранія. 126 тыс. ж. (1992). Трансп. вузел. Прыстань на воз. Шверынер-Зе. Прам-сць: машынабудаванне (вытв-сць суднавага, гідраўлічнага абсталявання), хім., мэблевая, гарбарная, швейная, харчовая. Мекленбургскі тэатр. Арх. помнікі 14—18 ст.

ШВЕ́ЦЫЯ (Sverige), Каралеўства Швецыя (Konungariket Sverige), дзяржава ў Паўн. Еўропе. Займае ўсх. і паўд. ч. Скандынаўскага п-ва, а-вы Готланд і Эланд у Балтыйскім моры. Мяжуе на З і Пн з Нарвегіяй, на ПнУ з Фінляндыяй; на Пд і У абмываецца Балтыйскім м. і яго Батнічным зал., на ПдЗ — пралівамі Катэгат, Скагерак, Эрэсун (аддзяляюць Ш. ад Данії). Пл. 450 тыс. км^2. Нас. 8877 тыс. чал. (2002). Дзярж. мова — шведская. Сталіца — г. *Стакгольм*. Краіна падзяляецца на 21 лен. Нац. свята — Дзень шведскага сцяга (6 чэрв.).

Герб і сцяг **Швецыі**.

Дзяржаўны лад. Ш. — канстытуцыйная манархія. Дзейнічае канстытуцыя 1975. Кіраўнік дзяржавы — кароль, які надзелены выключна прадстаўнічымі функцыямі і з'яўляецца сімвалам швед. дзяржавы і нацыі. Заканад. ўладу ажыццяўляе рыксдаг (парламент), які з 1971 аднапалатны, складаецца з 349 дэпутатаў, што выбіраюцца ўсеагульным галасаваннем на 4 гады. Выканаўчая ўлада належыць ураду на чале з прэм'ер-міністрам.

Прырода. На фарміраванне рэльефу вял. ўплыў зрабіла чацвярцічнае зледзяненне. Большую ч. тэр. займае пласкагор'е Норланд (выш. 500—800 м), якое з З і ПнЗ акаймоўваюць Скандынаўскія горы (найвыш. г. Кебнекайсе — 2123 м), на Пд — Сярэдняшведская нізіна і ўзв. Смоланд (выш. да 377 м). Рэльеф п-ва Сконе, а-воў Готланд і Эланд раўнінны. Карысныя выкапні: жал., ураванавыя, марганцавыя, медныя, свінцовыя, цынкавыя, тытанавыя руды, золата, серабро. Клімат умераны, пераходны ад марскога да кантынентальнага, на Пн — кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад 0 °С на Пд да -14 °С на Пн, ліп. адпаведна 17 і 10 °С. Ападкаў за год 700—1000 мм на З і Пд, 300—600 мм на У і Пн, 1500—2000 мм у горах. Каля 200 каравых ледавікоў (пл. каля 400 км^2) на Пн. Рачная сетка густая. Рэкі многаводныя, парожыстыя, багатыя гідраэнергіяй; найб. — Турнеэльвен, Далельвен, Кларэльвен, Онгерманэльвен. Азёры (Венерн, Ветэрн, Эльмарэн, Меларэн і інш.) займаюць каля 9% тэр., балоты — 14%. Водная сістэма Венерн — Гёта (720 км) уключае рэкі Кларэльвен, Гёта-Эльв і воз. Венерн. Глебы падзолістыя і балотныя, на Пд дзярнова-падзолістыя і бурыя лясныя, у Скандынаўскіх горах горна-падзолістыя і горна-тундравыя. Лясы займаюць 57% тэр. Пераважае тайга, на крайнім Пд — шыракалістыя лясы. У складзе жывёльнага свету лясоў: лось, буры мядзведзь, воўк, ліс, рысь, куніца, вавёрка, заяц-бяляк, барсук, еўрап. вожык; у тундры — расамаха, пясец, паўн. алень, лемінг; з птушак — качкі, гусі, чайкі, гагі. Рэкі і азёры багатыя рыбай (ласось, стронга, акунь, шчупак). Нац. паркі: Абіску, Мудус, Сарэк, Стура-Шофалет, Піельекайсе, Пад'еланта, Сонф'елет і інш., шматлікія рэзерваты.

Насельніцтва. Шведы складаюць 89% насельніцтва. Жывуць таксама фіны (2%), датчане, нарвежцы і інш., на Пн (у Лапландыі) — саамі (каля 15 тыс. чал.). Вернікі пераважна лютэране

(94%), ёсць католікі (1,5%), пяцідзесятнікі (1%) і інш. Натуральны прырост — -0,08% (2002). Сярэдняя шчыльн. 19,7 чал. на 1 км². Каля 85% насельніцтва жыве ў цэнтр. і паўд. ч. краіны. Гар. насельніцтва 83%. Найб. гарады (тыс. чал.): Стакгольм — 1626, Гётэбарг — 778 (з прыгарадамі, 2002), Мальмё — 243, Упсала — 181, Лінчэпінг — 129, Эрэбру — 125 (1994). У прам-сці занята 24% эканамічна актыўнага насельніцтва, у сельскай гаспадарцы — 2%, у абслуговых галінах — 74%.

Гісторыя. Тэр. Ш. заселена людзьмі больш за 12 тыс. гадоў назад. Каля 2500 да н.э. яны перайшлі ад палявання і рыбалоўства да аселай жывёлагадоўлі і матыжнага земляробства. Каля 2000 да н.э. іх падпарадкавалі жывёлагадоўчыя плямёны з кантынент. Еўропы. З пач.1-га тыс. да н.э. тут жылі плямёны свіёнаў, гаўтаў і інш., якія ўтваралі плем. саюзы, падпарадкоўваліся ўладзе ваен. правадыра (конунга), спавядалі агульнагерм. язычніцкую рэлігію. У выніку гандл. сувязей з Міжземнамор'ем на тэр. Ш. адчуваўся ўплыў грэч. і рым. культур. Тут склалася рунічная пісьменнасць сакральнага значэння. У 5—6 ст. н.э. ва ўсх. ч. Сярэдняй Ш. (Упланд) узнік плем. саюз свеяў, у 8—9 ст. — зародак швед. дзяржавы каралеўства свеяў Свіцьёд са сталіцай у г. Бірка (каля сучаснага г. Упсала). Паселішчы свеяў на балт. узбярэжжы былі базамі для паходаў *вікінгаў* (у Зах. Еўропе наз. *нарманамі*, на Русі — *варагамі*) з мэтамі гандлю і рабаўніцтва ў землях Русі, Візантыі, Балгарыі Волжска-Камскай, Хазарскага каганата; карысталіся *шляхам «з варагаў у грэкі»*. Паводле рас. летапісаў і *нарманскай тэорыі*, яны ўдзельнічалі ў фарміраванні *Кіеўскай Русі*. У 9—11 ст. свейскія каралі падпарадкавалі сабе амаль усю тэр. сучаснай Ш., акрамя паўд. і зах. ўзбярэжжаў, якія да 17 ст. былі пад уладай Даніі. Хрысціянства тут пашыралася з 9 ст., дзярж. рэлігіяй стала ў канцы 11 ст. пры каралю Олафе Скётканунгу. Кароль Эрык Эдварсан [каля 1156—60] арганізаваў крыжовы паход, які паклаў пачатак завяванню Фінляндыі. Ён прылічаны да святых як нябесны заступнік швед. каралёў. Дынастыя Эдварсана кіравала Ш. да 1250. У 1240 шведы спрабавалі ўварвацца ў Наўгародскую зямлю, але былі разбіты ў *Неўскай бітве*. У 1248—66 фактычным правіцелем краіны быў ярл Біргер — муж сястры караля Эрыка Эрыксана і бацька першага караля з дынастыі Фолькунгаў [1250—1363] Вальдэмара I [1250—75]. У 1252 засн. г. *Стакгольм*. Пры Біргеру і пазней у ваен. саперніцтве з Руссю працягвалася завяванне Фінляндыі, якая цалкам адышла да Ш. паводле Арэхаўскага міру 1323 з Ноўгарадам. Пры каралю Магнусе Эрыксане [1319—63] у 1347 уведзены адзіны для ўсёй краіны кодэкс законаў — Ландслаг. Незадаволеныя ўмацаваннем каралеўскай улады арыстакратычныя і царк. колы ў 1356 і 1363 (канчаткова) скінулі Магнуса. За спробу пазбавіць улады буйных феадалаў знаць скінула і наступнага караля Альбрэхта Мекленбургскага [1363—89]. Пасля дацка-швед. вайны 1389

Да арт. **Швецыя**. Ландшафт Смоланда.

Ш. ўзначаліла каралева Данії і Нарвегіі *Маргарыта Дацкая* [1389—1412]. У 1397 міждзярж. аб'яднанне Данії, Швецыі і Нарвегіі пад уладай дацкіх каралёў афармлена як *Кальмарская унія*. Незадаволенасць насельніцтва Ш. дацка-ням. панаваннем была прычынай неаднаразовых паўстанняў (з іх асабліва моцнае — пад кіраўніцтвам *Энгельбрэкта Энгельбрэктсана* ў 1434—36) і фактычнага скасавання Кальмарскай уніі. З 1435—36 у Ш. пачаў склікацца 4-саслоўны (з удзелам падатковых і каронных сялян) парламент—рыксдаг. У 1464—70 каралём Ш. быў швед. феадал Карл Кнутсан Бундэ пад імем Карла VIII. Яго пляменнік Стэн Стурэ ў 1470 выбраны рэгентам Ш., 10.10.1471 у бітве пры ўзвышшы Брункеберг (зараз у межах Стакгольма) ён разбіў армію дацка-нарв. караля Крысціяна I, які спрабаваў авалодаць швед. прастолам. Да 1520 Ш. кіравалі рэгенты з роду Стурэ. У 1477 засн. першы швед. ун-т у г. Упсала. У 1520 дацка-нарв. кароль Крысціян II разбіў армію рэгента Стэна Стурэ Малодшага (загінуў) і стаў швед. каралём. 8—9.11.1520 ён пакараў смерцю 82 прыхільнікаў Стурэ («Стакгольмская крывавая лазня»). У 1521 у прав. Даларна пачалося антыдацкае паўстанне, якое неўзабаве пазбавіла Крысціяна II улады над Ш. У 1523 кіраўнік паўстанцаў дваранін Густаў Эрыксан выбраны каралём пад імем *Густава I* [1523—60]. Ён заснаваў у незалежнай Ш. новую дынастыю Ваза [1523—1654]. У 1587—1668 прадстаўнікі гэтай дынастыі кіравалі таксама ў Польшчы і ВКЛ. Пры ўдзеле Густава I у Ш. ў 1527—39 праведзена царк. *рэфармацыя* ў духу *лютэранства*, у 1544 абвешчана спадчынная манархія.

Спроба каталіцкай *контррэфармацыі* пры Юхане III [1568—92] скончылася няўдачай. Пасля яго смерці лютэранства абвешчана дзярж. рэлігіяй. Прастол Ш. заняў сын Юхана III Сігізмунд, які ў 1587 быў выбраны таксама каралём Польшчы і вял. князем ВКЛ (гл. *Жыгімонт III*), афармілася *Шведска-польская унія 1592—99*. Аднак рэальная ўлада ў Ш. з 1595 была ў выбранага правіцелем дзяржавы Карла, дзядзькі караля. У 1598 Сігізмунд з войскам высадзіўся ў Ш., каб сілай аднавіць каталіцызм, але быў разбіты Карлам, які ў 1599 дамогся яго звяржэння са швед. прастола і ў 1604 сам стаў каралём пад імем Карла IX [1604—11]. У знешняй палітыцы швед. каралі прытрымліваліся наступальнага, агрэсіўнага курсу. У выніку войнаў 16—17 ст. супраць Данії, *Лівонскай вайны 1558—83*, інтэрвенцыі ў рас. дзяржаву ў час *Смуты* пач. 17 ст., удзелу ў *Трыццацігадовай вайне 1618—48*, *вайне Рэчы Паспалітай са Швецыяй 1600—29*, *Паўночнай вайне 1655—60* Ш. захапіла Эстонію, Паўн. Латвію з г. Рыга, рас. ўзбярэжжа Фін. заліва, Зах. Карэлію, Зах. Памеранію, ч. Паўн.-Зах. Германіі, стала пануючай дзяржавай на Балтыцы і адной з вял. дзяржаў Еўропы. У 1638—55 Ш. мела калоніі на Атлантычным узбярэжжы Паўн. Амерыкі (на тэр. сучасных ЗША). Гэтыя поспехі садзейнічалі ўмацаванню каралеўскай улады пры *Густаве II* Адольфе [1611—32] і наступных каралях. Дачка Густава II Крысціна [1632—54], апошняя з Вазаў, перадала прастол стрыечнаму брату Карлу Цвайбрукенскаму, які стаў каралём пад імем Карла X [1654—60] і заснаваў новую дынастыю. Пры ім пачалася *рэдукцыя* (канфіскацыя) землеўладанняў буйных феадалаў. Яна набыла шырокія памеры пры яго сыне Карле XI [1660—97], які, апіраючыся на дробнае дваранства і падатковыя саслоўі, устанавіў у Ш. рэ-



Да арт. **Швецыя**. Стакгольм.

Гётэбарг — порт **Швецыі**.

жым абсалютнай манархіі. Рэдукцыя не ліквідавала фін. цяжкасцей, выкліканых ваен. выдаткамі. Пры Карле XII [1697—1718] Ш. ўступіла ў *Паўночную вайну 1700—21*, у якой была пераможана, страціла Зах. Карэлію, Эстляндыю, Ліфляндыю, Паўн.-герм. ўладанні (акрамя Памеранії) і сваё становішча вял. дзяржавы. Карл XII быў забіты ў час уварвання ў Нарвегію, яго сястра Ульрыка Элеанора [1718—20] перадала прастол мужу прынцу Фрыдрыху Гесенскаму, які правіў пад імем Фрэдэрыка I [1720—51]. Паводле канстытуцыі 1719 рэальная паліт. ўлада належала рыксдагу. Няўдача Ш. ў рус.-швед. вайне 1741—43 (да Расіі адышла ч. Паўд.-Усх. Фінляндыі) прымусіла яе прызнаць наследнікам Фрэдэрыка I рас. стаўленіка Адольфа Фрэдэрыка Гольштэйн-Готарпа [1751—71], які паклаў пачатак гэтых няўдач Густаў IV быў скінуты, каралём стаў яго бяздзетны дзядзька Карл XIII [1809—18]. Паводле канстытуцыі 1809 (дзейнічала да 1974) Ш. канчаткова стала парламенцкай манархіяй з абмежаванымі правамі караля, скасаваны амаль усе прывілеі дваранства, уведзены некат. дэмакр. свабоды. Цаной далучэння да *кантынентальнай блакады* Вялікабрытаніі Ш. захавала за сабой Зах. Памеранію. З 1810 фактычным правіцелем краіны стаў запрошаны рыксдагам у якасці прастоланаследніка б. напалеонаўскі маршал Францыі Ж.Б.Бернадот, які пазней стаў каралём пад імем Карла XIV Юхана [1818—44] і засн. сучасную швед. каралеўскую дынастыю *Бернадотаў*. У 1812 ён заключыў сакрэтны саюз з Расіяй, у 1813 — з Вялікабрытаніяй, разам з якімі Ш. ў 1813—14 ваявала супраць Францыі і Даніі. Паводле *Кільскіх мірных дагавораў 1814* Данія саступіла Ш. Нарвегію, атрымаўшы ўзамен Швед. Памеранію (у 1816 перадана Прусіі). Пасля непрацяглага супраціўлення Нарвегія пагадзілася на дынастычную унію са Ш. на ўмовах шырокай аўтаноміі (гл. *Шведска-норвежская унія 1814—1905)*. З сярэдзіны 19 ст. ў Ш. адбываўся прамысл. пераварот, будаваліся чыгункі, асвойваліся лясныя і жалезарудныя багацці краіны. У 1864 абвешчана поўная свабода гандл.-прамысл. дзейнасці. Пры каралю Оскару II [1872—1907] Ш. стала традыцыйна нейтральнай краінай. У 1870-я г. створаны першыя прафсаюзы, пачала фарміравацца шматпарт. сістэма; у 1889 засн. *Сацыял-дэмакратычная рабочая партыя Швецыі* (СДРПШ). Да пач. 20 ст. Ш. стала індустр.-агр. краінай з развітымі машынабудаваннем і банкаўскай справай. У 1-ю сусв. вайну нейтральная Ш. фактычна займала прагерм. пазіцыі. Уздым яе эканомікі ў 1914—16 быў звязаны з выкананнем заказаў ваюючых краін. У 1918—20 Ш. ахапіў забастовачны рух, пад націскам якога ў 1919 прыняты законы аб 8-гадзінным рабочым дні і выбарчай рэформе, якая дала выбарчыя правы жанчынам і амаль зусім скасавала маёмасны цэнз. У 1920 дзейнічаў першы ўрад СДРПШ. У 1924 Ш. ўстанавіла дыпламат. адносіны з СССР. У 1920-я г., нягледзячы на паліт. нестабільнасць (змяніліся 9 урадаў), эканоміка Ш. перажывала росквіт, але ў гады сусв. крызісу 1929—33 вытв-сць рэзка скарацілася.

На хвалі незадаволенасці масавым беспрацоўем да ўлады ў 1932 прыйшла СДРПШ, якая ў кааліцыі з інш., пераважна левымі, партыямі кіравала краінай да 1976. Яна прапанавала праграму выхаду з крызісу з дапамогай дзярж. рэгулявання эканомікі пры захаванні яе прыватнаўласніцкага характару. У 1936—39 уведзены дзярж. дапамога маці і дзецям, дапамога па беспрацоўі, субсідыі на жыллёвае буд-ва, 2-тыднёвы аплатны адпачынак, абавязковая 7-гадовая адукацыя. Далейшыя захады ў гэтых і інш. кірунках паляпшэння становішча працоўных с.-д. ўрады рабілі і ў наступныя дзесяцігоддзі. У 2-ю сусв. вайну фармальна нейтральная Ш. пасылала добраахвотнікаў у Фінляндыю ў час *савецка-фінляндскай вайны 1939—40*, у 1941 і 1942 прапускала па сваёй тэр. гітлераўскія войскі, пастаўляла Германіі стратэг. матэрыялы. У той жа час яна дапамагала *руху Супраціўлення* ў Даніі. Пад націскам Вялікабрытаніі, ЗША і СССР Ш. ў 1943 спыніла герм. ваен. транзіт, у маі 1945 разарвала дыпламат. адносіны з Германіяй. У пасляваен. перыяд Ш. ўдзельнічала ў *Маршала плане*, але адмовілася ўступіць у НАТО, застаючыся нейтральнай краінай. У 1940—50-я г. працягваўся рост эканомікі, паляпшалася становішча працоўных. У 1968—69 праведзена частковая канстытуцыйная рэформа, 1.1.1975 уведзена ў дзеянне сучасная канстытуцыя Ш. Пагаршэнне эканам. становішча ў 1-й пал. 1970-х г. прывяло да ўлады ў 1976 урад правых на чале з лідэрам Партыі цэнтра Т.*Фельдзінам*. У 1982 СДРПШ перамагла на выбарах, прэм'ер-міністрам у другі раз стаў яе лідэр С.У.*Пальме*. Яго пераемнік з 1986 І.Г.*Карлсан* сутыкнуўся з ростам рабочага руху, спадам эканомікі ў пач. 1990-х г. Пасля выбараў 1991 сфарміраваны несацыяліст. ўрад К.*Більта*, але ў 1994 да ўлады прыйшоў урад с.-д. меншасці на чале з Карлсанам, які ў 1996 перадаў паўнамоцтвы прэм'ер-міністра і лідэра партыі Е.Персану. Па выніках выбараў 1998 і 2001 СДРПШ у саюзе з Левай партыяй (да 1991 Камуніст. партыя) застаецца кіруючай паліт. сілай у Ш. З 1973 каралём Ш. з'яўляецца Карл XVI Густаў. 1.1.1995 Ш. ўступіла ў *Еўрапейскі саюз*, але адмовілася ў 1997 і 2003 далучыцца да Еўрап. валютнага саюза і перайсці на адзіную еўрап. валюту. Асновай яе знешняй палітыкі застаецца традыц. нейтралітэт. Ш. — чл. ААН (з 1946), Савета Еўропы (з 1949), Еўрап. саюза (з 1995), інш. міжнар. арг-цый. Дыпламат. адносіны з

Да арт. **Швецыя**. Стакгольмская крывавая лазня 1520.

дынастыі *Готарпаў*. Яго сын кароль Густаў III [1771—92] рэфармаваў у духу асв. абсалютызму судаводства, цывільную ўладу, грашовую сістэму, армію, заахвочваў развіццё швед. навукі і л-ры, заснаваў Швед. АН, імкнуўся вярнуць Ш. становішча вял. дзяржавы. Ён правёў праз рыксдаг канстытуцыю 1772, якая ўзмацніла каралеўскую ўладу. Паражэнне Ш. ў вайне з Расіяй 1788—90 і абсалютысцкі рэжым выклікалі раздражненне арыстакратыі, і ў 1792 Густаў III быў забіты змоўшчыкамі. Яго сын *Густаў IV* Адольф [1792—1809] у саюзе з Вялікабрытаніяй удзельнічаў у ваен. кааліцыях 1805—07 супраць Францыі. У выніку такой палітыкі Францыя акупіравала Швед. Памеранію, а Расія, якая пасля *Тыльзіцкага міру 1807* часова стала саюзніцай Францыі, у выніку апошняй рус.-швед. вайны 1808—09 (гл. *Руска-шведскія войны 16—19 ст.*) далучыла да сябе Фінляндыю. У выніку

Рэспублікай Беларусь установлены 14.1.1992.

Палітычныя партыі і прафсаюзы. СДРПШ, Левая партыя, Памяркоўная кааліцыйная партыя, Партыя цэнтра, Нар. партыя — лібералы, Партыя аховы навакольнага асяроддзя — «зялёныя» і інш. Асн. прафс. аб'яднанні: Цэнтр. арг-цыя прафсаюзаў Ш., Цэнтр. арг-цыя прафсаюзаў служачых, Цэнтр. арг-цыя прафсаюзаў асоб з вышэйшай адукацыяй і дзярж. служачых.

Гаспадарка. Ш. — высокаразвітая індустр. краіна з інтэнсіўнай сельскай гаспадаркай; яе доля ў сусв. выт-сці — 1%, у сусв. гандлі — 2% (насельніцтва — 0,15%). Нац. эканам. мадэль — «шведскі сацыялізм» — рынечная эканоміка мяшанага тыпу з панаваннем прыватнай уласнасці, парламентарызмам у палітыцы і сталай сац. інфраструктурай. У эканоміцы дамінуюць буйныя манаполіі. На долю прыватнага сектара прыпадае 85%, дзярж. — менш за 15%. Валавы ўнутр. прадукт (ВУП) у 2001 склаў 219 млрд. дол. (24,7 тыс. дол. на 1 чал., 18-е месца ў свеце). У прам-сці ствараецца 32% ВУП, у сельскай, лясной гаспадарцы і рыбалоўстве — 2%, у сферы паслуг — 66%. Прамысловасць арыентавана на экспарт, яе прадукцыя пераважае ў знешнім гандлі краіны. Фундамент прам-сці — лес, жал. руда, гідраэлектраэнергія. Здабыча жал. руды ў Кіруне (запасы 2,8 млрд. т), золата, серабра, цынку, медзі, свінцу ў Норландзе. Выт-сць электраэнергіі 144,6 млрд. кВт·гадз (2001), пераважна на ГЭС (46%) і АЭС (45%). Ш. займае адно з вядучых месцаў у свеце па выпрацоўцы і спажыванні электраэнергіі на душу насельніцтва. Энергасістэма Ш. злучана з энергасістэмамі Даніі, Нарвегіі, Фінляндыі. Развіта чорная металургія, асабліва выт-сць высакаякаснай і спец. сталей. Штогадовая выплаўка сталі — 5 млн. т, чыгуну — 3 млн. т. Асн. цэнтры: Сандвікен, Фагерста, Бурленге, Лулео, Окселёсунд. Найб. сталеліцейны канцэрн «Шведская стальная кампанія» належыць дзяржаве. Каляровая металургія (выт-сць свінцу, медзі, алюмінію, пракату) у гарадах Шэлефтэо, Сундсваль, Вестэрос. У машынабудаванні (50% кошту прамысл. прадукцыі і 44% экспарту) вылучаецца судна- і аўтамабілебудаванне, эл.-тэхн., электронная, аэракасм. і ваен. прам-сць. Асн. цэнтры: Гётэбарг (судны, грузавыя і легкавыя машыны, падшыпнікі), Трольхетан (легкавыя машыны, дызелі, электравозы, гідратурбіны), Лінчэпінг, Іёнчэпінг (самалёты, касм. і ваен. абсталяванне), Мальмё (судны), Карльстад (абсталяванне для цэлюлозна-папяровай прам-сці). У Стакгольме (1/3 занятых) і Вестэросе сканцэнтравана эл. і электронная прам-сць. Буйныя канцэрны: «Вольва», «Сааб-Сканія» (аўтамаб.), «ААВ», «Л.М.Эрыксан», «Электралюкс» (эл.-тэхн. і электронная выт-сць). У 2001 выраблена 418,3 тыс. легкавых і 98,2 тыс. грузавых аўтамабіляў і аўтобусаў. Ш. мае самую магутную лесапарапрацоўчую прам-сць у Еўропе. У 1998 нарыхтавана 58,1 млн. м^3 драўніны, апрацавана на лесапільнях 15,1 млн. м^3. Выт-сць буд. матэрыялаў, мэблі, дамоў хуткай зборкі, паперы, кардону на прадпрыемствах, што размешчаны ўздоўж вусцяў рэк, якія ўпадаюць у Батнічны заліў. 2/3 прадукцыі лясной, дрэваапр. і цэлюлозна-папяровай прам-сці экспартуецца. Хім. прам-сць (выт-сць мінер. угнаенняў, сернай к-ты, лакаў, фарбаў, хлору, гумавых вырабаў) у гарадах Хельсінгбарг, Мальмё, Бафарс, Кілсар і інш., нафтаперапр. і нафтахім. — у Стэнунгсундзе (каля Гётэбарга). Фармацэўтычная і біятэхнал. галіны — самыя дынамічныя і перспектыўныя ў эканоміцы. Шведскія кампаніі «Астра», «Джонсан і Джонсан» і інш. спецыялізуюцца на выт-сці лекаў (Стакгольм, Упсала). Развіты лёгкая (тэкст., швейная), харч. (мясная, малочная, цукр., мукамольная), паліграф. прам-сць. Сельская гаспадарка вылучаецца высокай прадукцыйнасцю і інтэнсіўнасцю, амаль поўнасцю забяспечвае патрэбы краіны ў прадуктах харчавання. Апрацоўваецца каля 7% тэр., пераважна на Пд. Гал. галіна — малочна-мясная жывёлагадоўля. Пагалоўе (млн. галоў, 2001): буйн. раг. жывёлы — 1,65, свіней — 2,3, авечак — 0,45, птушак — 7,41. Буйн. раг. жывёлу гадуюць паўсюдна, свіней і свойскую птушку — на Пд. На Пн аленегадоўля. Раслінаводства пашырана ў паўд. раёнах, дзе вырошчваюць пшаніцу (збор 2,4 млн. т, 2001), ячмень (1,9 млн. т), сланечнік, рапс, цукр. буракі (2,6 млн. т), бульбу (1 млн. т, 1999). Рыбалоўства (селядзец, траска, макрэль, крэветкі, амары). Улоў рыбы і морапрадуктаў у 1999 склаў 364,1 тыс. т. Гал. рынак морапрадуктаў — Гётэбарг. Даўж. чыгунак 12,8 тыс. км, аўтадарог з цвёрдым пакрыццём 163,5 тыс. км, у т.л. хайвэй — 1,4 тыс. км. У краіне 3,7 млн. легкавых і 336 тыс. грузавых машын і аўтобусаў. Ва ўнутр. грузаабаротах пераважаюць чыг. перавозкі, у знешніх — марскія. Марскія паромы звязваюць Ш. з Даніяй і Германіяй. Гал. парты: Гётэбарг (1/3 грузаабароту Ш.), Хельсінгбарг, Кальмар, Мальмё, Стакгольм, Лулео. 48 аэрапортаў, у т.л. гал. міжнар. аэрапорт Арланда (каля Стакгольма). Экспарт (95,5 млрд. дол., 2000) машын і абсталявання, цэлюлозна-папяровай прадукцыі, лесу, жалеза, сталі, хімікатаў. Імпарт (80 млрд. дол., 2000) абсталявання і станкоў, нафты і нафтапрадуктаў, каляровых металаў і інш. Асн. гандл. партнёры: Германія (11% экспарту і 19% імпарту), Вялікабрытанія (9% і 10%), Данія (6% і 6%), Нарвегія, ЗША і інш. Гандл. абарот Беларусі з Ш. 79,2 млн. дол. (2001). Развіты турызм. У 2001 даход ад замежнага турызму склаў 3,9 млрд. дол. Грашовая адзінка — шведская крона.

Узброеныя сілы (2001). Уключаюць рэгулярныя ўзбр. сілы 33,9 тыс. чал.; рэзерв 262 тыс. чал.; пры адмабілізацыі — каля 800 тыс. чал. Вярх. галоўнакамандуючы — кароль. Камплектаванне паводле прызыву. Рэгулярныя ўзбр. сілы складаюцца з сухап. войск, ВПС, ВМФ. У сухап. войсках 19,1 тыс. чал., 500 танкаў, 1080 баявых машын пяхоты, 570 бронетранспарцёраў, 575 гармат на буксірнай цязе, 23 самаходныя гаўбіцы, 735 мінамётаў, каля 100 пускавых установак процітанк. кіроўных ракет, 600 зенітных установак, 1 самалёт, 104 верталёты і інш. У ВПС 7,7 тыс. чал., 387 баявых самалётаў. У склад тактычных часцей і падраздзяленняў уваходзяць знішчальныя, знішчальна-бамбардзіровачныя, трансп. і верталётная авіяц. эскадрыллі. У ВМС 7,1 тыс. чал., у т.л. 1,1 тыс. чал. у берагавой абароне, 320 у авіяцыі, 7 падводных лодак, 7 карветаў, 14 ракетных катэраў, 2 мінныя загараджальнікі, 21 мінна-тральны карабель, 1 разведвальны карабель, 16 буксіраў, 7 ледаколаў і інш.; у авіяцыі ВМС самалёты і верталёты; у берагавой абароне — 2 артыл. брыгады, 5 марскіх брыгад і інш.; на ўзбраенні — берагавая і зенітная артылерыя, мінамёты, проціракетныя карабельныя комплексы, пераносныя зенітныя ракетныя комплексы, мінныя загараджальнікі, малыя дэсантныя караблі, дэсантныя катэры, дапаможныя судны і інш.; у берагавой ахове — патрульныя караблі, патрульныя катэры, самалёты.

Асвета. Адукацыяй у Ш. кіруе Мін-ва асветы. Для дзяцей 3—6 гадоў існуюць дзіцячыя сады і гульнявыя школы. Абавязковая асноўная 9-гадовая школа падзяляецца на 3 ступені: ніжэйшую (1—3-і класы), сярэднюю (4—6-ы класы) і вышэйшую (7—9-ы класы). На працягу першых 6 гадоў усе вучні атрымліваюць аднолькавую агульнаадук. падрыхтоўку. У 7—9-х класах навучаюцца па т.зв. сістэме выбарных дысцыплін, калі акрамя асн. прадметаў вывучаюць 2 замежныя мовы, эканоміку, мастацтва, тэхніку; замежныя мовы і матэматыка маюць 2 узроўні — звычайны і павышаны. Пасля заканчэння 9-гадовай школы адукацыя працягваецца ў інтэграваных гімназіях з 22 аддзяленнямі, 5 з якіх (тэхн., прыродазнаўчае, гуманітарнае, эканам. і грамадазнаўчае; 3—4 гады навучання) рыхтуюць да паступлення ў ВНУ, астатнія (2-гадовыя) даюць прафес.-тэхн. падрыхтоўку. Каб працягваць адукацыю на аддзяленнях гімназіі, якія даюць права паступаць у ВНУ, у старэйшых класах абавязковай школы неабходна паспяхова вывучаць 2 замежныя мовы і матэматыку з павышаным курсам. Астатнія выпускнікі абавязковай школы могуць паступаць на тыя аддз. гімназіі, якія даюць незакончаную сярэднюю і пач. прафес. адукацыю. У сістэме вышэйшай адукацыі Ш. больш за 30 ВНУ, у т.л. 7 ун-таў: у Стакгольме (з 1877), Гётэбаргу (з 1891), Лундзе (з 1666), Упсале (з 1477), Умео (з 1963),

Лінчэпінгу (з 1970), Шведскі ун-т с.-г. навук, а таксама Каралеўская вышэйшая тэхн. школа ў Стакгольме (з 1827), тэхнал. ун-т у Гётэбаргу (з 1829), Каралінскі медыка-хірургічны ін-т у Стакгольме (з 1810) і інш. У 2002/03 навуч. г. было каля 300 тыс. студэнтаў. У рэгіёне Стакгольма знаходзіцца каля 20 каледжаў і ун-таў (каля 60 тыс. студэнтаў). Вышэйшая адукацыя бясплатная (плацяць толькі за падручнікі, за інтэрнат і робяць невял. ўзносы ў студэнцкі саюз). З пач. 1990-х г. сістэма вышэйшай адукацыі дэцэнтралізавана, кожная ВНУ самастойна вызначае змест і тэрміны навуч. праграм. Дыплом аб вышэйшай адукацыі студэнты атрымліваюць праз 2 гады навучання ў ВНУ, праз 3 гады — ступень бакалаўра, праз 4 гады — ступень магістра. Існуе таксама аспірантура і дактарантура. Найб. б-кі: ун-таў у Упсале (з 1620) і Лундзе, Каралеўская ў Стакгольме, гарадскія ў Стакгольме, Гётэбаргу і інш. Найб. музеі ў Стакгольме — Нац., сучаснага мастацтва, прыроднай гісторыі, навукі і тэхнікі, марскі, паўночны, скандынаўскі; у Гётэбаргу — гісторыі, мастацкі, марскі; у Лундзе — гісторыі культуры і інш. Навук. даследаванні вядуцца на кафедрах ВНУ, у прыватных н.-д. установах, у Ін-це ядз. хіміі Г.Вернера, Ін-це металаграфіі, а таксама ў Шведскай каралеўскай АН, Шведскай акадэміі л-ры, гісторыі і старажытнасці, Каралінскім медыка-хірургічным ін-це, якія прысуджаюць *Нобелеўскія прэміі*.

Друк, радыё, тэлебачанне. У 2000 у Ш. выдаваліся 163 штодзённыя газеты і інш. перыяд. выданні. Найб. тыражныя газеты: «Aftonbladet» («Вячэрняя газета», з 1830), «Dagens Nyheter» («Навіны дня», з 1864), «Expressen» («Экспрэс», з 1944), «Göteborgs-Posten» («Гётэбаргская пошта», з 1858), «Sydsvenska Dagbladet Snällposten» («Газета Паўднёвай Швецыі», з 1848). Нац. інфарм. агенцтва — Швед. тэлегр. бюро (з 1921). Радыёвяшчанне з 1923. Грамадская кампанія «Шведскае радыё» мае 4 агульнанац., 26 мясц. праграм і службу вяшчання на замежныя краіны. Дзейнічаюць 94 прыватныя мясц. і 1210 т.зв. абшчынных радыёстанцый. Тэлебачанне з 1956. Агульнанац. тэлекампаніі: грамадская «Шведскае тэлебачанне» (мае 2 праграмы), камерцыйныя «ТВ 4», «Канал 5», «Канал плюс», «ДТЮ-7». 10 спадарожнікавых і 94 кабельныя тэлеканалы. Ліцэнзаванне і кантроль за дзейнасцю аўдыёвізуальных сродкаў масавай камунікацыі ажыццяўляюць Адміністрацыя радыёвяшчання і тэлебачання і Камісія па тэлебачанні і радыёвяшчанні.

Літаратура. Першыя літ. помнікі на *шведскай мове* — рунічныя надпісы на камянях (паэт. тэкст Варына на Рокскім камені ў Эстэргётландзе, 9 ст.). У сярэдневяковуі рэліг. л-ра стваралася на лац. мове («Жыціе Крысціны са Стумбелена» Петруса дэ Дацыя, гімны біскупа Брунальфа Альгатсана, «Скарбы нябесных таямніц» св. Біргіты), бытавалі ананімныя песні-балады, хронікі, рыцарская і патрыят. паэзія, перапрацоўкі рыцарскіх легенд (канец 13—15 ст.). Першая друкаваная кніга на швед. мове — «Ад спакусаў д'ябла» (1495). Эпоха Рэфармацыі вызначылася з'яўленнем

Да арт. **Швецыя**. Замак у Кальмары.

поўнага перакладу Бібліі, які меў вял. значэнне ў станаўленні швед. літ. мовы (т.зв. «Біблія Густава Вазы», 1541). Адзін з перакладчыкаў Свяшчэннага пісання і аўтар рэліг.-палемічных твораў О.Петры. У 17 ст. барочны характар мела драматургія Ю.Месеніуса, паэзія Л.Віваліуса, Ю.Паўлінуса, кнігі гімнаў Е.Сведберга, Х.Спегеля. Творчасць Лусідора і Г.Шэрн'ельма прасякнута духам Адраджэння. Гіст. прозу распрацоўваў У.Рудбек. У 18 ст. пачынальнікам новай асветніцкай традыцыі стаў У.Далін, жанру рамана-апісання падарожжа — К. фон *Ліней*, Я.Валенберг, эпісталярную прозу ствараў К.Г.Тэсін. У традыцыях позняга барока развівалася творчасць К.М.Бельмана, сентыменталізму — Г.Ф.Кройца, Х.Ш.Нурдэнфлюкт, асветніцкага класіцызму — Г.М.Ленгрэн, Я.Х.Мёрка, Ю.Х.Чэльгрэна, перадрамантызму — Б.Ліднера, Т.Турыльда, Ф.М.Франсена. У станаўленні кансерватыўнай рамант. школы значную ролю адыграла Гоцкае таварыства (Ю.У.Валін, П.Х.Лінг, Э.Тэгнер). Іншую эстэт. праграму прапаноўвалі рамантыкі, аб'яднаныя вакол час. «Phosphoros» («Фасфорас»; П.Д.Атэрбум, Э.Ю.Стагнеліус). Пераход ад рамантызму да сац.-крытычнага рэалізму ў творах К.Ю.Л.*Альмквіста*, Э.Г.Геера, А.В.Рудберга, К.Снойльскага і інш. Рэаліст. тэндэнцыі ў творчасці Ф.Брэмер. У 19 ст. вял. ўплыў на развіццё л-ры Ш. мелі творы шведскамоўных пісьменнікаў Фінляндыі (Э.Р.Дыктуніус, І.Л.Рунеберг і інш.). На мяжы 19—20 ст. новыя перспектывы для развіцця л-ры адкрылі стваральнікі руху «Маладая Швецыя» (Ю.А.*Стрындберг*, В.Бенедыктсан, Г.Геерстам, Г.Ш.Лефлер-Эдгрэн, У.Хансан). Пад уплывам асэнсавання здабыткаў тагачасных нарв. і дацкай л-р, пашырэння новых філас. ідэй і канцэпцый узмацніўся рух за сац. справядлівасць. Вядомасць набылі творы Э.А.*Карлфельта*, С.Лагерлёф, К.Г.В. фон *Хейдэнстама*, Стрындберга. Уплывы ідэй дарвінізму, эстэт. школ неарамантызму праявіліся ў лірыцы О.Левертына, Г.Фродынга. У жанры балады, вулічнага шансона працавалі Д.Андэрсан, Э.Тоб, Н.Ферлін. Паэзія Б.Шоберга і В.Экелунда паклала пачатак мадэрнісцкай плыні ў швед. паэзіі 20 ст. (А.Н.*Лундквіст*, Х.Э.*Марцінсан*, К.Венберг, Я.Гульберг, Э.Ліндэгрэн, Г.Экелёф і інш.). Сімвалісцкі культ прыгажосці прадвызначыў творчасць паэта А.Эстэрлінга. Скептыцызм і імкненне да спасціжэння вечных ісцін дамінавалі ў лірыцы Б.Бергмана, прозе Я.Сёдэрберга і П.Хальстрэма. У пач. 20 ст. ў л-ры ўзнікла плынь «пралетарскага рэалізму» (М.Кок, І.Люхансан, М.Марцінсан, Л.Нурдстрэм, П.С.Сівертс, Г.Хедэнвінд-Эрыксан). Значная з'ява — мадэрнісцкая проза і драматургія Я.Бергмана, рэаліст. навелы і раманы В.Муберга. Эмацыянальным і сексуальным разняволенням адметныя раманы А. фон Крусеншэрны, вытанчаным псіхалагізмам і навацыямі — навелы і раманы Л.Аліна, сілай уяўлення — лірыка і проза К.Бое. Ідэі «гуманізму ў змаганні» ў экспрэсіянісцкай творчасці П.Ф.*Лагерквіста*, пачуцці экзістэнцыяльнай трывогі і страху ў прозе С.Дагермана, уплывы зах.-еўрап. мадэрнісцкіх плыняў у творах Э.*Юнсана*, В.Юнгквіста. У сярэдзіне 20 ст. вылучаліся сац. завостраныя сатыр. п'есы К.Герхарда, П.Рамеля, тэксты для кабарэшоу П.Родстрэма, Л.Форсела, гіст. эсэістыка Ф.Г.Бенгтсана, тэатр. драматургія і кінасцэнарыі І.*Бергмана*. У 1960—90-я г. вядомасць набылі сатыр. раманы Я.Мюрдаля, неарэаліст. проза С.Дэльбланка, П.У.Сундмана, Б.Тротцыг, дакумент. раманы-рэпартажы П.У.Энквіста, палітычна завостраныя раманы С.Лідман. Спалучэнне новабарочных і рамант. традыцый уласціва прозе Л.Густафсана, свет фантастыкі і абсурду, крыміналу ў раманах П.Валё, П.К.Ерсільда, М.Шоваль. Традыцыі сац.-гіст. эпапей прадоўжыла К.Экман, псіхал. прозы — Ё.Тунстрэм, П.Г.Эвандэр. У паэзіі мадэрнісцкую лінію працягвалі Ф.Ісаксан, Б.Сетэрлінд, інтэлектуальна насычаную, блізкую да традыц. форм лірыку — Л.Нурэн, С.Окесан, Б.Хокансан, Ч.Эспмарк і інш. Л-ру для дзяцей развівалі А.Г.Э.*Ліндгрэн*, Э.Бескаў, Э.Кей, А.М.Руас, А.Тэгнер, Ж.Утэрдаль, Л.Хельсінг і інш., драматургію — Нурэн, Энквіст. На бел. мове асобнымі выданнямі выйшлі творы Лагерквіста («Кат. Карлік», 1986; пер. М.Гіль, Г.Шупенька), М.Марцінсана («Мама выходзіць замуж», 1988; пер. В.Рабкевіч), Ліндгрэн («Браты Львінае Сэрца», 1990, 1997; пер. С.Лузгіна, Т.Лукша, С.Мураўёва; «Усе нашы дзеці з Булербю»,

2000; пер. Л.Баршчэўскі), Лагерлёф («Пярсцёнак Лёвеншольдаў», 1997; пер. М.Пазнякоў). Сярод інш. перакладчыкаў твораў швед. пісьменнікаў на бел. мову Р.Барадулін, В.Буйвал, Я.Бяласін, А.Разанаў.

Архітэктура. У 5—6 ст. створаны арх. комплекс з драўляным язычніцкім

Да арт. **Швецыя**. Інтэр'ер касцёла кляштара ў Вадстэне. 1369—1430.

храмам і 3 паўсферычнымі курганамі ў Старой Упсале. У 9—10 ст. узніклі першыя паселішчы гар. тыпу (Бірка і інш.), пасля 11 ст. — прыбярэжныя гарады з нерэгулярнай планіроўкай (Сігтуна, Вісбю на в-ве Готланд), у 13 ст. — Стакгольм. Гар. забудова была пераважна драўляная, абкружаная каменнымі ці драўлянымі умацаваннямі. Першыя хрысц. храмы зрубныя, прамавугольныя ў плане, з плеценым арнаментам разьбы, блізкія язычніцкаму мастацтву (цэрквы ў Хусабю, 11 ст.; Санкта-Марыя Мінар у Лундзе, 12—13 ст.). З 12 ст. ўзводзіліся замкі феадалаў з высокай (круглай ці квадратнай) драўлянай шмат'яруснай вежай («Парахавая вежа» ў Вісбю; замак у Кальмары, перабудаваны). Вылучаюцца замкі-ўмацаванні Глімінгехус, у Эрэбру, Нючэпінгу, Охусе. На фарміраванне сталага сярэдневяковага дойлідства паўплывалі сувязі з Францыяй, Германіяй, Англіяй, Паўн. Італіяй і Нідэрландамі. Запазычаныя маст. формы перапрацоўваліся ў духу мясц. традыцый. У інтэрнац. кірунку раманскага стылю створаны манум. сабор у Лундзе (11—12 ст., арх. Данатус і Рэгнерус, 3-нефавы, з трансептам і 2 усх. вежамі). На скрыжаваннях дарог будавалі цэрквы ў выглядзе круглай масіўнай вежы з байніцамі (у Хегбю). Каменныя храмы канца 12 ст. са строгім геам. узорам на франтонах зах. фасадаў (у Сігтуне). З сярэдзіны 13 ст. развіваўся гатычны стыль: саборы ў Упсале (з развітым хорам і вянком капэл вакол яго), Лінчэпінгу і інш. Культавыя будынкі в-ва Готланд вылучаліся багатым скульпт. убраннем парталаў, высокімі вежамі (цэрквы ў Руне, Санкта-Катарына ў Вісбю). Для позняй готыкі ўласцівы насычанасць фасадаў дэкорам, зорчатыя скляпенні (Стурчурка ў Стакгольме, касцёл кляштара ў Вадстэне). У сярэдзіне 16 ст. склаўся лакальны стыль — т.зв. «Ваза-рэнесанс», для якога характэрны спалучэнне мясц. традыцый фартыфікацыйнай архітэктуры з асобнымі формамі готыкі, рэнесансу, а пазней і барока (каралеўскія замкі Грыпсхальм, 1537; Вадстэна, 1545 — 17 ст.), багацце ўбрання інтэр'ераў. У 17 ст. разгарнулі-

ся вял. гарадабуд. работы, створаны ўпарадкаваныя кварталы і сістэмы плошчаў, рэгулярная сетка вуліц і каналаў (Карльскруна, Гётэбарг), ансамбль цэнтра Упсалы. Пабудовы 18 ст. ў стылі класіцызму і паладыянства (арх. *Тэсін*, С. і Ж. дэ ла Вале, Ю.Вінгбанс і інш.). У сельскай архітэктуры вызначыўся крапасны тып драўляных званіц (званіца царквы на в-ве воз. Стуршэн, 1754). У 19 ст. з эканам. ростам развіцця ўзніклі пабудовы ў духу эклектыкі (прамысл. карпусы, выставачныя павільёны, крытыя рынкі і інш.). З 1880-х г. развіваецца т.зв. нац. рамантызм (арх. І.Г.Класан, Р.Эстберг). У 1920-я г. фарміраваўся неакласіцызм (арх. Э.Г.*Асплунд*), які пад уздзеяннем ідэй Ле Карбюзье і «Баўгаўза» змяніўся на рацыяналізм (Асплунд, С.Г.*Маркеліус*, Н.С.Эрыксан, С.Бакстрэм). У канструктывісцкіх пабудовах 1940-х г. тэндэнцыі рэгіяналізму, сувязь з ландшафтам, мясц. буд. традыцыямі (арх. Э.Альсен). У 1944—52 на аснове комплекснай забудовы распрацаваны генплан Стакгольма, што стала пачаткам працэсу урбанізацыі ў краіне. У 1960—70-я г. архітэктура грунтуецца на простых аскетычных прынцыпах арганізацыі прасторы, пасля 1990-х г. у абліччы будынкаў з'явіліся рысы бруталізму, постмадэрнізму, імкненне да шматфункцыянальнасці рацыянальнага жыллёвага асяроддзя. У 1880 засн. Саюз швед. архітэктараў, у 1930 — Нац. асацыяцыя швед. архітэктараў.

Выяўленчае мастацтва. Найб. стараж. помнікі на тэр. Ш. — контурныя малюнкі жывёл на касцяных вырабах, керамічныя пасудзіны з лінейным, ямкавым і штрыхавым геам. узорам (8—3-е тыс. да н.э.), сякеры са скульпт. галовамі аленяў і ласёў (2-е тыс. да н.э.), блізкія мастацтву Паўн.-Усх. Еўропы (гл. *Фіна-угры*); шматфігурныя наскальныя малюнкі, зброя, упрыгажэнні, посуд эпохі бронзы. У 1-м тыс. н.э. з'явіліся вырабы ў т.зв. звярыным стылі. Ад 6—8 ст. захаваліся пахаванні знаці ў ладдзях з каштоўнымі зброяй і посудам; склаўся характэрны для стараж. мастацтва Ш. тып арнаментацыі на ювелірных вырабах — сіметрычнае пляценне ў выглядзе стылізаваных зааморфных фігур (фібулы-засцежкі, падвескі-брактэаты). У 7—8 ст. на в-ве Готланд пашырана разьба на пахавальных камянях-стэлах. Раманская скульптура прадстаўлена арнаментальнымі ці фігурнымі рэльефамі на парталах, капітэлях і алтарных балюстрадах. Востраў Готланд — гал. сканд. цэнтр вырабу разьбяных каменных парталаў, каменных і драўляных купеляў, працэсійных крыжоў («Укрыжаванне» ў саборы ў Хемсё, купель з сабора ў Трудэ, працэсійны крыж касцёла з в-ва Готланд). Унікальны помнік раманскай пластыкі — скульпт. ўбранне паўд. партала сабора ў Лундзе (12 ст.). Буйны цэнтр гатычнай скульптуры — г. Упсала. Жывапісу

Да арт. **Швецыя**. Працэсійны крыж касцёла з вострава Готланд. 13 ст.

эпохі готыкі, блізкаму да цэнтр.-еўрап., уласцівы прастата кампазіцыі, стрыманы каларыт, наіўнасць у перадачы дэталей (размалёўкі царквы ў Дынгтуне, Вестманланд, майстар Альбертус). На фарміраванне познагатычнага мастацтва

Да арт. **Швецыя**. А.Р а с л і н. Дама пад покрывам. 1768.

паўплывала творчасць ням. скульптара і жывапісца Б.Нотке з г. Любек (драўляная статуя «Святы Георгій», 1489, царква Стурчурка ў Стакгольме). Пад уздзеяннем галандскага мастацтва развіваліся партрэтны, пейзажны і анімалістычны жанры, а таксама манум. жывапіс (К.Арэнтсан, Х.Хансан; з замежных мастакоў — галандзец Д.Бек, французы С.Бурдон, Н.Валары, П.Сіньяк, англічанін А.Купер). Майстар дэкар. скульптуры — І.Хене (партал царквы Цюскачурка ў Стакгольме; грабніца М.Браге ў саборы Вестэраса, г. Вестманланд). У аздабленні палацаў і замкаў удзельнічалі замежныя скульпт. Ж.Б.Дзюзар, Н.Міліх, Б.Фуке, Р.Шаво і інш. Заснавальнік нац. школы жывапісу — Д.Эрэнстраль (познагатычныя плафонныя кампазіцыі ў палацы Дротнінгхольм, карціны «Укрыжаванне» і «Страшны суд» у царкве Стурчурка ў Стакгольме). У 17—19 ст. развівалася вытв-сць фаянсу, габелену, шаўковых тканін, вырабаў з металу. Уздым маст. жыцця Ш. звязаны са стварэннем у Стакгольме Каралеўскай АМ (1765). З 18 ст. развіваліся гіст. (К.Г.Піла) і быт. (Н.Лафрэнсен, П.Хілестрэм) жанры, у росквіце арыстакратычны партрэт (А.*Раслін*, Д. фон Крафт, Г.Лундберг). Заснавальнік скульптуры класіцызму — Ю.Т.Сергель. У жывапісе канца 18 — пач. 19 ст. дамінаваў акадэмізм (Ю.Н.Бюстрэм, Б.Э.Фогельберг). У 1-й пал. 19 ст. пашырана манум. і садова-паркавая скульптура (работы Ю.П.Муліна, Фогельберга). Цікавасць да нац. гісторыі і фальклору абуджала творчасць мастакоў-рэалістаў Н.Я.Бломера, М.Э.Вінге, Ю.Г.Сандберга і інш. Пейзажысты В.Бем, А.Ліндман, Р.Нурстэт і інш. распрацоўвалі прынцыпы паўн. пленэрызму. Антыакад. кірунак прывёў да стварэння аб'яднання «Мастацкі саюз» (1886). Дасягненне рэалізму канца 19 — пач. 20 ст. — партрэты А.*Цорна*, Р.Берга, Э.Юсефсана, жанравыя сцэны К.В.Вільхельмсана, К.Ларсана, пейзажы К.Ф.Хіля, прынца Яўгена, анімаліст. карціны Б.Лільефарса, пазначаныя рысамі імпрэсіянізму. З 20 ст. ў аснове мастацтва — фігуратыўна-рэаліст. пачатак, выкарыстанне прыёмаў новых еўрап. плыней (постімпрэсіянізму, кубізму, фавізму) у спалучэнні з нац. традыцыямі. Вылучаліся І.Агелі, І.Груневальд, імпрэсіяніст К.Ісаксан, экспрэсіяніст — пісьменнік і жывапісец Ю.А.Стрындберг. Да нац. фальклору звярталіся Х.Лінквіст, Э.Хальстрэм, С.Эрыксан. Сярод кубістаў С.Дэркерт, Г.Паўлі (тэарэтык і прапагандыст), В.Эгелінг. З 1920-х г. рэаліст. пейзажы і партрэты стваралі Х.Ослунд, Т.Пальм, Х.Сур і інш., сярод абстракцыяністаў — О.Г.Карлсунд, М.В.Сванберг, Эгелінг, сюррэалістаў — т.зв. Хальмстадская група на чале з Э.Ольсанам, экспрэсіяністаў — Г.Ларсан, Т.Рэнквіст. У 2-й пал. 20 ст. ў кірунку наіўнага рэалізму працавалі жывапісцы О.Шольд, Э.Юхансан-Тор. У аздабленні грамадскіх будынкаў і іх інтэр'ераў высокага ўзроўню дасягнулі Х.Лінквіст, Э.Форсет, Р.Янсан. У скульптуры значныя работы К.*Мілеса*, С.Блумберга, Б.Марклунда, Б.Юрта і інш. У 1950—70-я г. развівалася абстрактна-эксперым. пластыка ў творчасці Перневі, Рэнквіста, А.Юнеса. У дызайне вял. дасягненне — маст. канструяванне мэблі з гнуткага дрэва (К.Б.Матсан), пашырана вытв-сць прадметаў хатняга ўжытку, маст. шкла (Э.Берг, С.А.Гільгрэн, С.Пальмквіст, Э.Флемінг). З 1980-х г. у мастацтве пашыраны разнастайныя мадэрнісцкія плыні (поп-арт, гіперрэалізм і інш.). У нар. мастацтве захаваліся традыцыі разьбы па дрэве, ткацтва, керамікі, вышыўкі, кавальства, апрацоўкі металу, скуры, косці. У 1832 засн. Швед. маст. асацыяцыя, у 1845 — Т-ва дызайнераў.

Да арт. **Швецыя**. Ю.Т.Сергель. Спячы Фаўн. 1774.

Музыка. Ад стараж. нар.-песеннай культуры захаваліся пастухоўскія вальвіса, сэтэрсонг, блізкія ёдлям, мастацтва сял. музыкантаў-спельманаў. Сярод нар. інструментаў: траскуфіоль, нюкельхарпа (стр.-смыкавыя), хюмель, лонгспель (стр.-шчыпковыя), рог, лур, спельпіпа, сэкпіпа (духавыя). У 11—12 ст. на фарміраванне царк. музыкі паўплывалі ням. і англ. (грыгарыянскі спеў). У эпоху Рэфармацыі і швед. абсалютызму ўзнік т.зв. нар. харал, які аб'яднаў рысы грыгарыянскага харала і нар. песні. Да 17 ст. гал. роля ў муз. жыцці належала іншаземцам. Першы вядомы швед. кампазітар 1-й пал. 18 ст. — Ю.Руман (аўтар кантат, сімфоній; рэфармаваў заснаваную ў 1526 Стакгольмскую прыдворную капэлу, арганізаваў пастаянныя адкрытыя канцэрты). Сярод кампазітараў 18 ст. К.Бельман (паклаў пачатак нац. песеннай традыцыі), 19 ст. — Ф.Бервальд (першы швед. сімфаніст, прадстаўнік рамантызму). Кампазітары А.Ліндблад, Л.Нурман, А.Сёдэрман, І.Хальстрэм, Э.Шогрэн у сваіх творах спалучалі нац. фалькл. элементы з рысамі ням. рамантызму. Стваральнік швед. нац.-рамант. оперы В.Петэрсан-Бергер, нац.-рамант. сімфоніі — Г.Альвен, В.Стэнхамар. Сусв. вядомасць набыла спявачка Е.*Лінд*. У пач. 20 ст. кампазітары К.Атэрберг, Н.Берг, Т.Рангстрэм пры захаванні нац. каларыту арыентаваліся пераважна на неарамантызм. Для музыкі 1-й пал. 20 ст. характэрны ўплывы неакласіцызму, у 1950—60-я г. — схіленне да розных праяў авангардызму. Уклад у развіццё муз. мастацтва Ш. 20 ст. зрабілі: кампазітары Я.Барк, Л.Э.Ларсан, Я.Мортэнсан, Б.Нільсан, Г.Ністрэм, А.Петэрсан, Х.Русенберг, Э.Тубін, Б.Хамбрэус; дырыжоры С.Вестэрберг, С.Фрукберг, С.Эрлінг; піяністы Х.Лейграф, С.Эрыксан; скрыпачы Д.Бартаў, Л.Берлін, Э.Вольф; віяланчэліст Э.Блёндаль-Бенгтсан; спевакі Ю.Б'ёрлінг, Н.Геда, Б.Нільсан, М.Халін; музыказнаўцы Г.Конар, Я.Лінг. У Ш. дзейнічаюць: Каралеўская опера (з 1773), больш за 10 прафес. аркестраў, у т.л Гётэбаргскі сімф. аркестр, Стакгольмскі камерны хор, Дзярж. вышэйшая муз школа ў Стакгольме, кансерваторыя ў Мальмё. Шырока развіты харавы рух Існуюць 3 творчыя аб'яднанні кампазітараў.

Да арт. **Швецыя**. Э.Юсефсан. Жыццярадаснасць. 1887.

Тэатр. Тэатр. элементы былі ў язычніцкіх рэліг. абрадах. У 15—16 ст. пашырыліся школьныя т-ры. У 1649 у Стакгольме адкрыты першы прыдворны т-р, у якім да пач. 19 ст. выступалі замежныя трупы. У 1682—91 існаваў Студэнцкі т-р Упсальскага ун-та (першая нац. сцэна). У 1737 у Стакгольме аматарская трупа з ліку дваран і чыноўнікаў атрымала назву «Каралеўскай швед. сцэны». Пазней узніклі агульнадаступ-

ныя швед. т-ры ў Гётэбаргу (1779), Стакгольме (Каралеўскі драм. т-р, 1787). Да 1870-х г. ставілі пераважна франц. вадэвілі, «слёзныя» меладрамы, псеўдагіст. трагедыі А.Кацэбу і яго паслядоўнікаў. Стыль акцёрскага выканання вызначаўся падкрэсленай дэкламацыйнасцю. У 1870-я г. ў рэпертуары прыватных і дзярж. т-раў з'явілася т.зв. новая драма — п'есы Г.*Ібсена*, Б.М.*Б'ёрнсана* і інш. У канцы 19 — пач. 20 ст. сусв. вядомасць т-ру Ш. прынесла рэаліст. драматургія Ю.А.*Стрындберга*, які ў 1907 разам з рэж. А.Фалькам адкрыў у Стакгольме эксперым. «Інтымны тэатр». Вял. ўплыў на фарміраванне тэатр. мастацтва Ш. ў 20 ст. зрабіла творчасць ням. рэж. М.*Райнгарта*, а таксама гастролі Маскоўскага маст. т-ра (1921—22) і знаёмства з дзейнасцю К.Станіслаўскага і У.Неміровіча-Данчанкі. Прынцыпы псіхал. рэалізму на швед. сцэне зацвердзілі акцёры А. дэ Валь, І.Хедквіст, Э.Хільберг, В.*Шострэм*, І.Экман і інш. У 1-й пал. 20 ст. значна паўплывалі на развіццё тэатр. мастацтва рэжысёры І.*Бергман*, У.Муландэр, А.Шоберг. Пасля 2-й сусв. вайны ў Ш. ўзнік шэраг прыватных т-раў, рэпертуар якіх складала т.зв. драматургія абсурду. На дзярж. сцэне ставілася пераважна класіка і п'есы замежных драматургаў (Ж.П.Сартр, Ж.Ануй, А.Мілер, Э.Олбі, Б.Брэхт, А.Чэхаў, Л.Талстой, М.Горкі, У.Маякоўскі і інш.). У Ш. дзейнічаюць: Каралеўскі драм. і гар. т-ры, шэраг прыватных т-раў у Стакгольме, драм. т-ры ў Гётэбаргу, Мальмё і інш.; дзярж. гастрольны «Рыкс-тэатр» дае спектаклі ў невял. гарадах Ш. Сярод акцёраў сучаснага т-ра Э.Адальфсан, П.Аскарсан, Э.Дальбек, К.Каўлі, Я.Куле, У.Пальме, М. фон Сюдаў, А.Трэтаў, І.Тулін і інш. Стакгольмскі т-р «Маньяна» ўдзельнічаў у Міжнар. тэатр. фестывалі «Белая Вежа — 1999» у Брэсце.

Кіно. Першыя кіназдымкі хронікі ў Ш. адбыліся ў 1896—98. У 1907 створана кінафірма «Свенска біо», якая экранізавала творы скандальнай л-ры: «Вермландцы» (паводле Ф.Дальгрэна, 1909), «Вяселле ў Ульфасе», «Рэгіна фон Эмерыц» (паводле З.Тапеліуса, абодва 1910). У 1910—20-я г. ў Ш. склалася т.зв. швед. класічная школа, якая паўплывала на сусв. кінематограф. Буйнейшыя яе прадстаўнікі — В.*Шострэм* («Тэр'е Віген», 1916, паводле Г.Ібсена; «Дзяўчына з Балотнага хутара», 1917, «Сыны Інгмара», 1918, «Вознік», 1920, усе паводле С.Лагерлёф), М.Стылер («Сучасная суфражыстка», 1913, «Каханне і журналістыка», 1916, «Эратыкон», 1920). Эстэтыку школы развівалі рэжысёры К.Барклінд, Ю.Бруніус, Г.Муландэр і інш. У 1920—30-я г. кінематаграфія Ш. заняпала. У 1940-я г. створаны шэраг антыфаш. фільмаў: «Стаўка — жыццё» (рэж. А.Шоберг), «Небяспечныя шляхі» (рэж. А.Хенрыксан), «Першая дывізія» (рэж. Х.Экман), «Нябачная сцяна» (рэж. Муландэр), «Жыві небяспечна» (рэж. Л.Фальк) і інш. У 1940—50-я г. кіно Ш. развівалася ў рэчышчы фюрціяталізму (кірунак у швед. л-ры і мастацтве): фільмы Шоберга («Цкаванне»), І.*Бергмана* («Крызіс», «Дождж над нашым каханнем», «Карабель ідзе ў Індыю», «Музыка ў цемры»), Муландэра («Жанчына без твару», «Ева», «Разведзены»), Экмана («Змена цягніка», «Дзяўчына і гіяцынты»), Л.Э.Чэльгрэна («Пакуль горад спіць», «Насілле», «Жорсткая гульня», «Начное святло»). У 1950—60-я г. асобнае месца займала творчасць Шоберга, які сфарміраваў швед. акцёрскую школу (А.Б'ёрк, Э.Дальбек, С.Ерэль, У.Пальме, М.Сетэрлінг, А.Чэлін, У.Якабсан і інш.). З'явай сусв. кінамастацтва сталі фільмы Бергмана, у якіх ён звярнуўся

Да арт. **Швецыя**. Кадр з кінафільма «Асенняя саната» І.Бергмана. 1978.

да філас. праблем, даследавання жан. псіхалогіі: «Лета з Монікай» (1953), «Сёмая пячатка», «Сунічная паляна» (абодва 1957), «Крыніца» (1960), «Маўчанне» (1963), «Час ваўка», «Сорам» (абодва 1968), «Дакрананне» (1971, з Вялікабрытаніяй), «Шэпты і крыкі» (1972) і інш. З Бергманам працавалі акцёры Б.Андэрсан, Х.Андэрсан, Г.Б'ёрнстранд, Я.Куле, М. фон Сюдаў, І.Тулін, Л.Ульман, Э.Юсефсан і інш., аператары С. Нюквіст, Г.Фішэр. У 1960-я г. ўзнік кірунак «новае швед. кіно», для якога характэрны пошукі экспрэсіўных сродкаў кінамовы, выкарыстанне ў маст. кіно прыёмаў і сродкаў выразнасці дакументальнага. Сярод прадстаўнікоў гэтага кірунку рэжысёры Р.Андэрсан («Гісторыя кахання», «Гіліяп»), С.Б'ёркман («Я кахаю, ты кахаеш»), Б.*Відэрберг* («Дзіцячая каляска», «Варонін квартал», «Каханне-65», «Прывітанне, Раланд!», «Эльвіра Мадыган», «Джо Хіл», «Асалода і вялікая прыгажосць»), І.Гамлін («Паляванне», «Купальшчыкі»), Сетэрлінг («Закаханыя пары», «Начныя гульні», «Дзяўчаты»), Я.Хальдаф («Міф», «Уле і Юлія», «Вечарына служачых фірмы», «Вяселле», «Сябры», «Джэк», «Не пакідай мяне адну»), Л.Хальстрэм («Хлопец і дзяўчына», «У мяне будзе дзіця») і інш.

Развіваецца дзіцячы кінематограф. Экранізаваны творы А.Ліндгрэн (рэж. О.Хельбум), М.Грыпе (рэж. Ч.Грэдэ, К.Полак) і інш. Сярод лепшых фільмаў 1970—90-х г. «Сцэны са шлюбнага жыцця», «Твар у твар», «Асенняя саната» (з ФРГ і Нарвегіяй), «Фанні і Аляксандр» Бергмана, «Ілюзіі» Л.Мульбака, «Прытулак анёлаў», «На яркім сонцы», «Апошні танец» К.Натлі, «Паляўнічыя» Шч.Сандвала, «Эмігранты», «Пасяленцы», «Бабах!», «Вікторыя», «Палёт «Арла», «Гамсун» Я.Труэля, «Толькі ты і я» С.Устэн, «Рукі» Р.Хоберта, «Альфрэд» В.Шомана і інш. Асобнае месца займаюць фільмы «Нядзельныя дзеці» (рэж. І. і Д. Бергманы, 1991, прэмія Міжнар. кінафестывалю ў Манрэалі), «Добрыя намеры» (рэж. Б.Аўгуст, 1992, Залатая пальмавая галіна Міжнар. кінафестывалю ў Канах), «Спавядальныя гутаркі» (1996), «Няверная» (2000, рэж. абодвух Ульман). Сярод вядучых кінарэжысёраў М.Арнэ, Бергман, Відэрберг, Грэдэ, І.Корнель, С.Ларсан, І. дэ Рэес, Труэль, К.Улафсан, Устэн і інш. Штогод у Ш. выпускаецца 20 маст. фільмаў; дзейнічае каля 45 кінакампаній («Свенск фільміндустры», «Сінема Арт прадакшэн», «Кадмас фільм», «Стэфан Ярл фільмпрадукшэн», «Вікінг фільм», «Алімпія фільм прадукшэн» і інш.) і шэраг пракатных кінакампаній; кінаінстытут (з 1963, з 1966 выпускае фільмы), пры якім існуе кінашкола (з 1965); школа пры Драм. т-ры ў Стакгольме; у Стакгольмскім ун-це — факультэт кіназнаўства.

Да арт. **Швецыя**. Кадр з кінафільма «Варонін квартал» Б.Відэрберга. 1963.

Беларусы ў Швецыі. Пачатак выезду беларусаў у Ш. адносіцца да канца 19 ст. Найб. іх колькасць апынулася там у выніку 1-й і 2-й сусв. войнаў, але значная тэр. раскіданасць не спрыяла зарганізаванасці беларусаў у Ш. У жн. 1948 у Стакгольме на з'ездзе мясц. беларусаў засн. іх першая арг-цыя «Бел. грамада», якая праіснавала да 1975 (стваральнік суполкі — бел. эмігрант, ураджэнец Са-

кольскага пав. Беласточчыны В.Лукашык). У канцы 1940-х — пач. 1950-х г. колькасць беларусаў у Ш. значна паменшылася ў сувязі з іх выездам у інш. краіны і вяртаннем на радзіму. Далейшая дзейнасць большасці беларусаў, што засталіся ў Ш., у нац. і рэліг. кірунках не вызначалася. Іх грамадскакульт. праца вядзецца ў межах т-ваў, засн. сумесна з рускімі і ўкраінцамі — «Привет» (з 1976), «Чайка» (з 1982), «Журавушка». Адзначаюцца бел. нац. святы, юбілеі вядомых бел. пісьменнікаў і паэтаў. Па швед. тэлебачанні вядуцца бел перадачы. У 1995 засн. бел. суполка «Беларусь».

Літ.: История Швеции. М., 1974; Ковалевский С.Д. Образование классового общества и государства в Швеции. М., 1977; Брауде Л.Ю. Сказочники Скандинавии. М., 1974; Иконников А.В. Современная архитектура Швеции. М., 1978; Чернышева О.В. Швеция в годы второй мировой войны: Экономика, политика, рабочее движение. М., 1980; Широкорад А.Б. Северные войны России. М.; Мн., 2001; Катлярчук А. Швэды ў гісторыі й культуры беларусаў. Мн., 2002; Шведы о своем социализме // Пробл. мира и социализма. 1990. № 4; Линг Я. Шведская народная музыка: Пер. с швед. М., 1981; Aulin A., Connor H. Svensk musik. Bd. 1—2. [Stockholm], 1974—77; История западноевропейского театра. Т. 5. М., 1970; История зарубежного театра. Т. 2. 2 изд. М., 1984; Суполка «Беларуская грамада» ў Швецыі // Ніва (Беласток). 2002. 31 сакавіка.

Н.П.Чаркасава (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *П.А.Тупік* (гісторыя), *В.А.Юшкевіч* (узбр. сілы), *Л.У.Языковіч* (асвета), *Л.А.Фядотаў* (друк, радыё, тэлебачанне), *Л.П.Баршчэўскі* (літаратура), *Я.Ф.Шунейка* (архітэктура, выяўл. мастацтва), *В.С.Іваноўскі* (тэатр), *Г.У.Шур* (кіно), *А.С.Ляднёва*, *У.Я.Калаткоў* (беларусы ў Швецыі).

ШВІ́НГЕР (Schwinger) Джуліус (Юліус) (12.2.1918, Нью-Йорк — 16.8.1994), амерыканскі фізік, адзін са стваральнікаў *квантавай электрадынамікі*. Чл. Нац. АН ЗША (1949), Амер. акадэміі навук і мастацтваў (1948). Скончыў Калумбійскі ун-т (1936). З 1945 у Гарвардскім, з 1972 у Каліфарнійскім (г. Лос-Анджэлес) ун-тах. Навук. працы па ядз. фізіцы, квантавай тэорыі поля, стат. фізіцы, тэорыі хваляводаў. Паказаў, што ўзаемадзеянне магн. момантаў нейтронаў з эл. полем ядра вядзе да іх рассеяння (1937; швінгераўскае рассеянне). Даў каварыянтную фармулёўку квантавай электрадынамікі, незалежна ад С.*Таманагі* прапанаваў метад перанарміровак, вылічыў анамальны магн. момант электрона, растлумачыў лэмбаўскі зрух (1948—49). Выказаў гіпотэзу аб існаванні двух тыпаў нейтрына і ідэю аб'яднання слабых і электрамагнітных узаемадзеянняў (1957). Нац. навук. медаль ЗША (1964). Нобелеўская прэмія 1965 (з Р.Ф.*Фейнманам* і Таманагам).

Тв.: Рус. пер. — Теория квантованных полей. М., 1956; Частицы, источники, поля. Т. 1—2. М., 1973—76. *М.М.Касцюковіч.*

ШВІНД (Schwind) Морыц фон (21.1.1804, Вена — 8.2.1871), нямецкі і аўстрыйскі мастак. Вывучаў філасофію ў Венскім ун-це (1818—21), вучыўся ў Венскай (1821—23) і Мюнхенскай (з 1828) АМ. Працаваў пераважна ў Мюнхене, а таксама Карлсруэ і Франкфурце-на-Майне, часта наведваў Вену. У жанравых кампазіцыях, карцінах на тэмы ням.-аўстр. казак і легенд, ілюстрацыях, прасякнутых іроніяй і дабрадушным гумарам, сюжэты трактуюцца ў міфа-паэтычным вытлумачэнні, характэрным для позняга рамантызму: «Падарожжа Фалькенштайна» (1843—44), «Ружа» (1847), «Вясельнае вандраванне» (1862); размалёўкі Венскай оперы (1864—67).

Дж.**Швінгер**.

ШВІ́ЦКАЯ ПАРО́ДА буйной рагатай жывёлы, парода мяса-малочнага кірунку. Выведзена ў горных р-нах Швейцарыі. Пашырана ў краінах Еўропы і ЗША. Выкарыстоўвалася пры вывядзенні *кастрамской пароды*, алаўцкай, каўказскай бурай і інш. парод.

Жывёлы прапарцыянальнага целаскладу, моцнай канстытуцыі. Тулава доўгае. Галава сярэдняй велічыні з шырокім ілбом. Рогі светлыя з цёмнымі канцамі. Масць бурая. Пародныя прыметы — светлае кольца вакол цёмнага насавога «люстэрака», светлы рэмень уздоўж спіны. Маса быкоў 800—950, кароў 480—550 кг. Забойны выхад 55—60%. Надой малака за год 3500—4000 кг, тлустасць 3,7—3,8%.

Швіцкая парода.

ШВО ў хірургіі, злучэнне тканак і краёў *раны* з дапамогай *хірургічных інструментаў* і шыўнага матэрыялу.

Для паверхневых (скурных) Ш. выкарыстоўваюць шоўк, лаўсан і інш. палімерныя матэрыялы; для Ш., што накладваюць на ўнутр. органы і тканкі — рассысальны матэрыял (напр., кетгут). Паводле тэрмінаў накладання Ш. у залежнасці ад характару раны адрозніваюць першасныя, першасныя адтэрмінаваныя і другасныя Ш. Выкарыстоўваюць таксама бясшвовае злучэнне тканак (кляі з палімерных матэрыялаў, метал. скобы).

ШВЯ́ДАС (Švedas) Іонас Ізідараус (9.10.1908, г. Ліепая, Латвія — 15.10.1971), літоўскі харавы дырыжор, кампазітар, педагог. Нар. арт. СССР (1954). Скончыў Клайпедскае муз. вучылішча (1929). З 1930 артыст Каўнаскага т-ра. З 1935 выкладаў у Каўнаскай, у 1945—70 у Літ. (з 1967 праф.) кансерваторыях. У 1940—62 арганізатар і маст. кіраўнік ансамбля песні і танца «Летува». У 1946—70 гал. дырыжор рэсп. свят песні. Сярод твораў: кантаты для салістаў, хору і арк., у т.л. «Нямунас» (1964); інстр. творы, хар. і сольныя песні; апрацоўкі нар. песень; музыка да драм. спектакляў і кінафільмаў. Адзін з аўтараў Дзярж. гімна Літ. ССР (1950). Дзярж. прэмія СССР 1950.

Л.А.Шымановіч.

ШВЯЦО́ВА Вера Мікалаеўна (н. 2.10.1929, г. Чарапавец, Расія), расійская і латвійская артыстка балета, педагог. Засл. арт. Латвіі (1958). Скончыла Ленінградскае харэаграфічнае вучылішча (1948). Вучаніца А.*Ваганавай*. У 1948—73 працавала ў т-рах оперы і балета Ленінградскім Малым і Латв. у Рызе, імя Спендыярава ў Ленінградзе, у т-рах Берліна, адначасова выкладала ў харэаграфічных вучылішчах у Рызе (з 1961; з перапынкам) і Берліне (1963—65). З 1979 выкладае ў Бел. харэаграфічным каледжы. Сярод выкананых партый: Скайдрыце («Стабурадзе» А.Калніньша), Эгіна («Спартак» А.Хачатурана), Медора, Жызэль («Карсар», «Жызэль» А.Адана), Анэль («Каля блакітнага Дуная» на муз. І.Штрауса), Сванільда («Капелія» Л.Дэліба), Кітры («Дон Кіхот» Л.Мінкуса) і інш. *І.Л.Чэбан.*

ШВЯЦО́Ў Аркадзь Дзмітрыевіч (24.1.1892, пас. Ніжнія Сяргі Свярдлоўскай вобл., Расія — 19.3.1953), расійскі канструктар авіяц. рухавікоў. Д-р тэхн. н. (1940), ген.-лейт. інжынерна-тэхн. службы (1948). Герой Сац. Працы (1942). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча (1921). З 1934 гал. канструктар авіяматорабуд. з-да. Распрацаваў першы сав. серыйны авіярухавік паветр. ахаладжэння М-11 (1926) для самалётаў По-2 (У-2), Як-18 і інш. Пад яго кіраўніцтвам створаны рухавікі М-22, М-62, АШ-82 і інш. Дзярж. прэміі СССР 1942, 1943, 1946, 1948.

Літ.: Грин Б.Д. Генеральный конструктор А.Д.Швецов. Пермь, 1964; Яго ж. Высокое небо. Пермь, 1973.

ШВЯЦО́Ў Вадзім Сяргеевіч (17.11.1922, г.п. Санчурск Кіраўскай вобл., Расія — 19.12.1997), бел. мастак. Скончыў Мінскае маст. вучылішча (1954). У 1954—82 выкладаў маляванне ў Мінскім тэхнал. тэхнікуме. Аўтар гумарыстычных і сатыр. малюнкаў для бел. часопісаў.

Аформіў і праілюстраваў некалькі выданняў з серыі «Бібліятэка «Вожыка», «Грушы на вярбе» С.Шушкевіча (1969). Аўтар зб. карыкатур «Дзякуй за ўсмешку» (1973) і інш. Творы вылучаюцца актуальнасцю праблематыкі, добразычлівым гумарам, сатыр. вастрынёй.

Л.Ф.Салавей.

ШКАДАРЭ́ВІЧ Аляксей Пятровіч (н. 27.10.1947, г. Капыль Мінскай вобл.), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1988), праф. (1990). Скончыў БДУ (1970). З 1970 у Ін-це фізікі АН Беларусі, з 1979 у Бел. оптыка-мех. аб'яднанні. З 1992 дырэктар дзярж. прадпрыемства «ЛЭМТ». Навук. працы па лазернай фізіцы, оптыцы і оптаэлектроніцы, па стварэнні цвердацельных перанастройвальных лазераў з селектыўнай пампоўкай. Распрацаваў шэраг аптычных і лазерных прылад спец. прызначэння для медыцыны і прам-сці. Дзярж. прэмія Беларусі 2000.

Тв.: Лазеры в клинической хирургии. Мн., 1997 (у сааўт.); Низкоинтенсивные лазеры в клинической практике. Мн., 1998 (у сааўт.).

М.П.Савік.

ШКАЙ, у традыцыйнай мардоўскай (мокша) рэлігіі і міфалогіі вышэйшы бог-светастваральнік. Паводле міфа, Ш. стварыў злога духа шайтана, якога прымусіў дастаць жменю зямлі са дна першаснага акіяна. Потым гэтая зямля пачала цудоўным чынам вырастаць і ўтварыла зямную сушу.

ШКАЛА́ (ад лац. scala лесвіца), 1) частка адліковага прыстасавання вымяральнай прылады ў выглядзе сукупнасці метак (пунктаў, штрыхоў, размешчаных у пэўнай паслядоўнасці) і прастаўленых побач з імі лічбаў або інш. сімвалаў, адпаведных значэнням велічыні, якая вымяраецца. Дзяленні Ш. могуць размяшчацца па акружнасці, дузе, прамой лініі, а сама Ш. можа быць раўнамернай, квадратычнай, лагарыфмічнай і інш. Для долевай ацэнкі дзяленняў Ш. выкарыстоўваюць *ноніусы*. 2) Сістэма велічынь, прынятых для вымярэння або ацэнкі пэўнай якасці, уласцівасці і да т.п. (напр., *тэмпературная шкала*, Ш. цвёрдасці паводле Роквела, Вікерса, Брынеля).

ШКАЛА́ ЭЛЕКТРАМАГНІ́ТНЫХ ХВАЛЬ, прынятая (паводле ўзгаднення) паслядоўнасць значэнняў, прысвоеных даўжыням хваль (ці частотам) эл.-магн. выпрамянення, упарадкаваных па іх нарастанні або спаданні (гл. табл.). Гл. таксама *Спектр, Электрамагнітныя хвалі*.

Шкала электрамагнітных хваль

Частата, Гц	Даўжыня хвалі, м	Назва дыяпазону
10^3—10^{12}	$3\cdot10^5$—$3\cdot10^{-5}$	Радыёхвалі
10^{12}—$3{,}75\cdot10^{14}$	$3\cdot10^{-5}$—$8\cdot10^{-7}$	Інфрачырвонае выпрамяненне
$3{,}75\cdot10^{14}$—$7{,}5\cdot10^{14}$	$8\cdot10^{-7}$—$4\cdot10^{-7}$	Бачнае святло
$7{,}5\cdot10^{14}$—$3\cdot10^{17}$	$4\cdot10^{-7}$—10^{-9}	Ультрафіялетавае выпрамяненне, мяккае рэнтгенаўскае выпрамяненне
$3\cdot10^{17}$—$3\cdot10^{20}$	10^{-9}—10^{-12}	Рэнтгенаўскае выпрамяненне, гама-выпрамяненне
$3\cdot10^{20}$—10^{23}	10^{-12}—$3\cdot10^{-15}$	Гама-выпрамяненне

ШКА́ПСКІ Алег Барысавіч (22.7.1917, г. Калуга, Расія — 8.1.1968), бел. акцёр. Засл. арт. Беларусі (1955). Скончыў Ленінградскі тэатр. ін-т (1938, педагог Л.*Віўен*). У 1939—41 і з 1944 у Дзярж. рус. драм. т-ры Беларусі. Характарны акцёр. Яго мастацтву ўласцівы спалучэнне ўнутр. логікі паводзін персанажа з тонка распрацаваным знешнім малюнкам, выразная міміка, гумар. Майстар эпізадычных роляў. Сярод лепшых: Якаў Трошын, Дуньчын муж («Дзеці сонца», «Варвары» М.Горкага), Васілій Шуйскі («Цар Фёдар Іаанавіч» А.К.Талстога), Блазан («Дванаццатая ноч» У.Шэкспіра), Вайнанен і Першы афіцэр («Аптымістычная трагедыя» У.Вішнеўскага), Сядлецкі («Фізікі-лірыкі» Я.Волчака), Альберта Стыльяна («Мая сям'я» Э. Дэ Філіпа). З інш. роляў: Аляксееў, Малышаў («Галоўная стаўка» і «Брэсцкая крэпасць» К.Губарэвіча), Казарын («Маскарад» М.Лермантава), Жэронт («Хітрыкі Скапэна» Мальера), доктар Беланціоні («Венецыянскія блізняты» К.Гальдоні).

А.А.Савіцкая.

ШКАРЛЯТЫ́НА (італьян. scarlattina ад позналац. scarlatum ярка-чырвоны), вострая інфекцыйная хвароба чалавека (пераважна дзяцей 2—10 гадоў). Характарызуецца запаленнем паднябенных міндалін і драбнакропкавай высыпкай на скуры. Узбуджальнік — β-гемалітычны стрэптакок групы А. Крыніца інфекцыі — хворы на Ш., стрэптакокавую ангіну, а таксама носьбіты стрэптакока.

Перадаецца паветрана-кропельным шляхам, праз рэчы хворага, інфіцыраваныя малочныя прадукты. Узбуджальнік укараняецца праз слізістыя абалонкі ротаглоткі або пашкоджаныя скурныя покрывы (напр., пасля апёкаў), выклікае запаленчы працэс. Скрыты перыяд Ш. — 2—7 дзён. Прыкметы: боль у горле пры глытанні, налёт на міндалінах, павелічэнне і балючасць вугласківічных лімфатычных вузлоў, высыпка з канца 1-га або на 2-гі дзень з далейшым лушчэннем. Найб. колькасць элементаў высыпкі ў складках скуры, на бакавой паверхні жывата і грудной клеткі. Характэрная прыкмета Ш. — «маліновы» язык. Ускладненні: пашкоджанні нырак, сэрца, суставаў. Лячэнне тэрапеўтычнае. Хворага ізалююць на 10 дзён, на дзіцячы калектыў накладаюць 7-дзённы каранцін.

А.А.Астапаў.

ШКАРУ́БА Валерый Фёдаравіч (н. 10.12.1957, г. Барысаў Мінскай вобл.), бел. жывапісец. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1981). Працуе пераважна ў жанры пейзажа: «Туман» (1987), «Цішыня» (1988), «Яблынька», «Зварот», «Стары сад» (усе 1989), «Раніца», «Надзея», «Паміж небам і зямлёй» (усе 1900), «Белы змрок», «Жураўлі прыляцелі», «Раўнавага», «Чаканне» (усе 1991), «Маўклівасць», «Шлях смутку» (абодва 1992), «Змрок» (1994), «Успамін» (1995), «Пахаладала» (1996), «Восеньскія думы», «Дакрананне» (абодва 1997), «Дарога», «Да захаду», «Да святла», «Хваляванне» (усе 2000), «Да вясны» (2001), «Цішыня», «Роздум», «Во-

В.**Швяцоў**. Карыкатура «Дзякуй за ўсмешку». 1973.

В.**Шкаруба**. Пахаладала. 1996.

сеньскае святло» (усе 2002), «Уварванне» (2003), цыкл «Спрадвечнае» (2002) і інш. Творы вызначаюцца монахраматычнасцю, некаторай каларыстычнай змрочнасцю, графічнасцю прапрацоўкі дэталей, гарманічнай арганізацыяй прасторы, вытанчанасцю. Дзярж. прэмія Беларусі 2003. *Л.Ф.Салавей.*

У.В.Шкатэлаў.

ШКАТЭ́ЛАЎ Уладзімір Віктаравіч (19.5.1861, С.-Пецярбург — 7.10.1940), бел. хімік; адзін з заснавальнікаў лесахіміі на Беларусі. Акад. АН Беларусі (1929), д-р хім. н. (1889), праф. (1893). Засл. дз. н. Беларусі (1938). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча (1884). Працаваў у Пятроўска-Разумоўскай акадэміі, Новаалександрыйскім ін-це сельскай і лясной гаспадаркі, Харкаўскім хіміка-тэхн. ін-це. З 1923 праф. Бел. ін-та сельскай і лясной гаспадаркі ў Мінску, з 1925 у БСГА. У 1930 дырэктар НДІ хіміі АН Беларусі. З 1930 заг. кафедры Бел. лесатэхн. ін-та ў Гомелі, з 1938 заг. лабараторыі НДІ хіміі АН Беларусі. Навук. працы па даследаванні саставу і будовы прыродных смаляных кіслот і шкіпінараў. Арганізаваў здабычу хваёвай жывіцы і яе перапрацоўку. Яго даследаванні сталі асновай тэхнал. працэсаў на айч. каніфольна-шкіпінарных з-дах (Барысаўскім і Бабруйскім).

Тв.: О химическом составе смол. М., 1889; О составе твердой части естественной смолы и канифоли. Мн., 1939.

Літ.: Скрыган А.І. У.В.Шкатэлаў // Весці АН БССР. Сер. фіз.-тэхн. навук. 1961. № 2.

ШКВАЛ (ад англ. squall), моцны парывісты вецер (скорасць больш за 30 м/с) са зменамі напрамку, які суправаджаецца навальніцай і ліўнем. Назіраецца пры праходжанні лініі халоднага фронту ў цыклонах сярэдніх шырот, а таксама пры моцнай канвекцыі. Доўжыцца некалькі хвілін.

ШКЕЛЬ Міхаіл Пятровіч (н. 1.3.1918, в. Бялевічы Слуцкага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне земляробства. Д-р с.-г. н. (1979). Скончыў Львоўскі с.-г. ін-т (1953). З 1960 заг. аддзела Мінскай абл. с.-г. доследнай станцыі, з 1963 у Бел. НДІ земляробства і селекцыі. Навук. працы па выкарыстанні ўгнаенняў для павышэння ўрадлівасці дзярнова-падзолістых глеб, павелічэнні ўраджайнасці с.-г. культур і паляпшэнні іх якасці. Распрацаваў тэарэт. асновы выкарыстання серы як элемента жыўлення раслін ва ўмовах Беларусі і прапанаваў практычны спосаб выкарыстання серных угнаенняў.

Тв.: Известь и урожай. Мн., 1969; Азбука земледельца. Мн., 1972 (разам з К.І.Доўбанам); Применение серосодержащих удобрений. Мн., 1979; Научные основы применения удобрений в западном регионе СССР. Мн., 1981 (у сааўт.); Справочник агронома. Мн., 1982 (у сааўт.); Оптимальные параметры плодородия почв. М., 1984 (у сааўт.).

ШКІЛЕ́Т (ад грэч. skeletos літар. — высахлы), цвёрдая формаўтваральная аснова цела жывёл і чалавека, якая складаецца з комплексу касцей, шкілетнага храстка і калясустаўных тканак, злучаных з суставамі. Засцерагае ад пашкоджання і падтрымлівае ўнутр. органы, у пазваночных змяшчае чырв. *касцявы мозг*, з'яўляецца дэпо мінералаў (солі кальцыю, фосфару і інш.), служыць месцам прымацавання мышцаў і ўтварае сістэму рычагоў, якія рухаюць цела і яго асобныя элементы. Косці і храсткі злучаюцца паміж сабой рухома (суставы) або нерухома (швы і зрашчэнні). У беспазваночных жывёл Ш. звычайна вонкавы (у выглядзе кутыкулы, ракавіны або хіцінавага панцыра). У пазваночных — сукупнасць *хорды*, касцей і храстка; акрамя вонкавага Ш. (напр., луска, касцявыя і рагавыя пласцінкі), ёсць унутр. Ш. — асн. апорныя структуры, якія служаць і месцамі прымацавання мышцаў. Адрозніваюць Ш. галавы (*чэрап*), восевы (хорда або *пазваночнік*) і Ш. канечнасцей. У чалавека маса Ш. складае 9—18% масы цела, у яго ўваходзіць 206 касцей з уласцівымі канстытуцыянальнымі і палавымі асаблівасцямі. Даследаванні Ш. неабходны для анатоміі, палеанталогіі, рэнтгеналогіі. *А.С.Леанцюк.*



Шкілет чалавека: 1 — чэрап; 2 — шыйныя пазванкі; 3 — ключыца; 4 — лапатка; 5 — плечавая косць; 6 — грудныя пазванкі; 7 — паяснічныя пазванкі; 8 — падуздышная косць; 9 — крыж; 10 — сцегнавая косць; 11 — надкаленнік; 12 — косці ступні; 13 — вялікая галёначная косць; 14 — малая галёначная косць; 15 — косці кісці; 16 — локцевая косць; 17 — прамянёвая косць; 18 — рэбры.

ШКЛО́НДЗЯ, шкіленда, у беларусаў адзін з відаў мясной каўбасы, напханай у тоўстыя кішкі. Найб. пашырана на Гродзеншчыне, у паўн.-зах. ч. Беларусі. Ш. рабілі таксама са свіных вантроб, крыві.

ШКІПІНА́Р, лятучае арган. рэчыва, сумесь тэрпенавых вуглевадародаў (гл. *Тэрпены*). Уваходзіць у састаў смол хвойных дрэў.

Бясколерная ці жаўтаватая гаручая вадкасць з хваёвым пахам, шчыльн. 850—870 кг/м^3, $t_{кіп}$ 150—170 °С. Вельмі рэакцыйназдольны, на паветры акісляецца, утвараючы смалу. Растваральнік, ацэтоне, абс. этаноле; не растваральнік ў вадзе. Добра растварае тлушчы, алеі, смолы. Атрымліваюць з *жывіцы* (жывічны Ш., або тэрпенцінавае масла), экстрагаваннем бензінам з хваёвага або кедравага асмолу (экстракцыйны Ш.), піролізам хваёвага асмолу (сухаперагонны Ш.), як пабочны прадукт у вытв-сці цэлюлозы (сульфатны і сульфітны Ш.) або пры гідролізе драўніны (гідролізны Ш.). Выкарыстоўваюць як растваральнік, сыравіну ў вытв-сці *камфоры*, ядахімікатаў і інш., у медыцыне.

ШКІ́РМАН Станіслаў Фёдаравіч (н. 27.1.1938, г. Смаленск, Расія), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1996). Скончыў БДУ (1961). З 1960 у Ін-це фізікі, з 1992 у Ін-це малекулярнай і атамнай фізікі Нац. АН Беларусі. З 2002 у Вышэйшым каледжы сувязі (г. Мінск). Навук. працы па тонкаструктурнай электронна-вагальнай спектраскапіі макрацыклічных тэтрапірольных малекул, палярызаванай люмінесцэнцыі арган. злучэнняў, нізкатэмпературнай фотахіміі дамешкавых цэнтраў у цвёрдых целах.

Тв.: Спектроскопия порфиринов: Колебательные состояния. Мн., 1985 (у сааўт.); Дискретные спектры люминесценции больших органических молекул и их применения (разам з К.М.Салаўёвым) // Журн. прикладной спектроскопии. 1991. Т. 54, № 3; Вибронные и колебательные спектры фталоцианинов и

их аналогов (у сааўт.) // Спектроскопия и люминесценция молекулярных систем. Мн., 2002.

ШКЛАБЛО́КІ, будаўнічыя пустацелыя вырабы са *шкла*, звараныя па контуры з 2 прасаваных паўблокаў.

Бываюць квадратныя, прамавугольныя, вуглавыя. Вонкавыя паверхні звычайна гладкія, унутр. гладкія ці рыфленыя (каб лепш рассейваць святло). Паводле святлотэхн. якасцей бываюць святлорассейвальныя, святлонакіравальныя і цеплапаглынальныя; бясколерныя ці каляровыя, а таксама дэкаратыўныя. Маюць дастатковую мех. трываласць, хім. ўстойлівасць. Герметычна замкнёная поласць усярэдзіне Ш. надае ім высокія цепла- і гукаізаляцыйныя якасці. Выкарыстоўваюць для запаўнення вонкавых светлавых праёмаў будынкаў, муроўкі сцен, перагародак, шкленя лесвічных клетак і інш.

ШКЛАВА́ТА, штучная *вата*, атрыманая з хаатычна пераблытаных шкляных валокнаў. Вырабляецца пераважна раздзьмухваннем расплаўленай шкляной масы струменем вадзяной пары ці нагрэтага сціснутага газу. Аб'ёмная маса Ш. да 130 кг/м^3, дыяметр валокнаў 5—12 мкм, каэф. цеплаправоднасці (пры т-ры 25±5 °С) 0,35 Вт/(м·К). Выкарыстоўваюць як *гукаізаляцыйны матэрыял* і *цеплаізаляцыйны матэрыял*.

ШКЛАПЛА́СТЫКІ, матэрыялы на аснове палімераў (*пластычныя масы*), што ў якасці ўшчыльняльнага напаўняльніка маюць шкловалакно. Вырабляюцца пераважна на аснове сінт. *смол*. Ш. — лёгкія (шчыльн. 1600—1900 кг/м^3), трывалыя, устойлівыя супраць агрэсіўных асяроддзяў, добрыя электраізалятары.

Паводле тыпу напаўняльніка і тэхнал. уласцівасцей кампазіцыі падзяляюцца на шклотэксталіты (напаўняльнік — *шклотканіна*), шкловалакніты (напаўняльнік — пасечаныя *шкляныя валокны*, жгуты), арыентаваныя (напаўняльнік — пасмы валокнаў, ніткі, жгуты, укладзеныя паралельна адно аднаму). З Ш. робяць прафіляваныя, буйнагабарытныя аб'ёмныя і інш. вырабы. Ш. — канстр. і электраізаляцыйны матэрыял у хім. і нафтавай прам-сці, авіяц. і ракетнай тэхніцы, буд-ве.

Я.М.Кавалёў.

ШКЛАРЭ́З, ручны інструмент для рэзання *шкла* таўшчынёй да 6 мм (ролікавыя Ш.) і да 10 мм (алмазныя Ш.).



Шкларэзы: 1 — алмазны; 2 — ролікавы.

Складаецца з драўлянай або пластмасавай ручкі і малатка-аправы, у корпус якога ўстаўлены крышталі алмазу (да 0,16 карата) або ролікі з цвёрдага сплаву. Выкарыстоўваецца пры *шкляных работах*.

ШКЛО, цвёрды аморфны матэрыял, які атрымліваюць пераахалоджваннем расплаваў з шклоўтваральнымі кампанентамі. Адрозніваюць штучнае Ш. і прыроднае (вулканічнае). Паводле складу вылучаюць Ш. адна- і шматкампанентнае; паводле прыроды шклоўтвальнага кампанента — элементнае (на аснове серы, селену, фосфару), аксіднае (сілікатнае, баратнае, фасфатнае), галагеніднае і інш. Найб. пашырана сілікатнае Ш. (на аснове крэменязёму).

Сілікатнае Ш. — цвёрдае крохкае рэчыва рознай празрыстасці, шчыльн. 2200—2500 кг/м^3, цвёрдасць 5—7 (па шкале Моаса). Тэрмічна і хімічна ўстойлівае. Вараць Ш. ў пячах пры т-ры 1400—1600 °С, сыравіна — *шкловыя пяскі*, сода, мел і інш. Паводле прызначэння адрозніваюць аконнае Ш., посуднае, хім.-лабараторнае, тэрмаметрычнае, аптычнае, буд., электравакуумнае і інш. З Ш. робяць *шкляное валакно* і інш. Гл. таксама *Шкляная прамысловасць*.

ШКЛО АПТЫ́ЧНАЕ, неарганічнае *шкло* з высокай празрыстасцю і аптычнай аднароднасцю. Вырабляецца з дакладна зададзенымі значэннямі паказчыка *пераламлення святла* і каэфіцыента яго дысперсіі. Асн. віды Ш.а. — крон (малы *пераламлення паказчык* і павышаная дысперсія) і флінт (з процілеглымі ўласцівасцямі). Выкарыстоўваецца для вырабу празрыстых элементаў аптычных інструментаў і прылад.

ШКЛО АРГАНІ́ЧНАЕ, тэхнічная назва аптычна празрыстых матэрыялаў на аснове палімераў (поліакрылатаў, полістыролу, полікарбанатаў). Найб. пашыраны поліметылметакрылат (плексіглас) — палімер метылавага эфіру метакрылавай к-ты.

Празрыстае бясколернае цвёрдае рэчыва. Шчыльнасць 1187 кг/м^3, т-ра размякчэння каля 105—110 °С. Раствараецца ў ацэтоне, дыхлорэтане, бензоле, воцатнай к-це і інш. Лёгка паддаецца мех. апрацоўцы, фармуецца. Устойлівае супраць вады, шчолачаў, водных растворaў неарган. к-т. Атрымліваюць блочнай полімерызацыяй метылметакрылату. Выпускаецца Ш.а. бясколернае і афарбаванае, празрыстае і непразрыстае і інш. Выкарыстоўваюць у авіяц., суднабуд., аўтамаб., хім. прам-сцях, медыцыне і інш.

ШКЛО ГУ́ТНАЕ, вырабы, атрыманыя спосабам свабоднага выдзімання без выкарыстання форм; від *шкла мастацкага*. Шкловыдзімальная трубка, вынайдзеная ў 1 ст. да н.э., дазволіла вырабляць просты, агульнадаступны утылітарны посуд і ствараць складаныя формы, танкасценныя, часам двухслойныя пасудзіны вял. памераў (эліністычнае і стараж.-рым. Ш.г.). Гутныя вырабы дэкарыруюцца ляпнымі пластычнымі дэталямі, уплаўленымі ў тоўшчу шкла (найб. вядомы вырабы венецыянскіх шкловыдзімальшчыкаў Адраджэння). На Беларусі высокага ўзроўню Ш.г. дасягнула ў 16—17 ст.; з 2-й пал. 19 ст. вырабы з яго ствараюць на шклозаводзе *«Нёман»* (гл. *Нёманскае шкло*).

Літ.: Яніцкая М.М. Вытокі шкларобства Беларусі. Мн., 1980; Яе ж. Беларускае мастацкае шкло, XIX — пачатак XX ст. Мн., 1984.

М.М.Яніцкая.

ШКЛО МАСТА́ЦКАЕ, вырабы са шкла, якія маюць якасці маст. твора; галіна *дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*. Творы Ш.м. (вітражы, смальтавыя мазаікі, посуд, арх. дэталі, скульптурныя кампазіцыі, дробная пластыка, свяцільні, біжутэрыя і інш.)



Да арт. **Шкло мастацкае.** Вітраж Шартрскага сабора. Францыя. 12—13 ст.

Да арт. **Шкло мастацкае.** Л.К.Тыфані. Лямпа. Канец 1800 — пач. 1900-х г. ЗША.

выраблюць без формы (гл. *Шкло гутнае*) ці з дапамогай фармоўкі. Вырабы дэкарыруюць у гарачым (прылепы, пяцяткі, аплікацыі, дробная пластыка, каляровая крошка, сульфідныя, крыялітавыя, каляровыя, бясколерныя ніці) і халодным (алмазная грань, шліфоўка, разьба, траўленне, пескаструменная тэхніка, фотадрук, размалёўка) стане.

Да арт. **Шкло мастацкае**. Шклянка і келіхі мануфактуры ў Налібаках. 1760—75.

Да арт. **Шкло мастацкае**. Л.М я г к о в а. Набор «Бубновы» і вазы. 1970.

Да арт. **Шкло мастацкае**. У.М у р а х в е р. Дэкаратыўная пластыка «Монстры». 1971.

Да шэдэўраў стараж. Ш.м. належаць стараж.-егіп. чаша Тутмоса III (каля 1450 да н.э.) рымскія «дыятрэты», упрыгожаныя ўзорам са шкляных ніцей, іранскія фігурныя пасудзіны з каляровага шкла, размаляванае шкло Германіі. На тэр. Кіеўскай Русі творы Ш.м. вядомы з 11—12 ст. Віды Ш.м. і спосабы яго дэкарыравання развіваліся ў рэчышчы існуючых маст. стыляў. У сярэдневякоўі посуд абмотвалі шкляными ніцямі; *венецыянскае шкло* вылучаецца філігранным узорам і размалёўкай эмаллю, *чэшскае шкло* — пышнай гравіроўкай у спалучэнні з разьбой і шліфаваннем, англ. хрусталь — бліскучым алмазным граненнем, галандскае шкло — тэхнікай пункціравання алмазам, рас. Ш.м. 19 ст. — багатай гамай колеру і граненнем т.зв. рус. каменем, франц. шкло пач. 20 ст. — тэхнікай гале (глыбокая разьба і хім. траўленне шматслойнага каляровага шкла). Пошукі новых якасцей пластычнай выразнасці шкла, формаўтваральных ідэй, адкрыццё новых тэхнік і тэхналогій у пач. 20 ст. А.Кро, Э.Гале, А.Даўмам, Р.Лалікам (Францыя), Л.К.Тыфані (ЗША), І.Драганеўскім (Чэхія) паўплывалі на з'яўленне аўтарскага Ш.м. З 2-й пал. 20 ст. пашырыліся жанры шклапластыкі.

На Беларусі Ш.м. вядома з 2—5 ст. (гл. *Абідзенскія эмалі*). У 11—13 ст. з каляровага празрыстага і бясколернага шкла выраблялі пацеркі, бранзалеты, пярсцёнкі, каляровыя палівы, аздобы для абкладаў кніг і інш. З 11 ст. пачалася вытв-сць смальты. У 15—16 ст. высокага ўзроўню дасягнула вытв-сць гутнага шкла. Вырабы аздаблялі ляпным дэкорам (шкляныя ніці, жгуты, медальёны і пяцяткі з барэльефнымі выявамі гербаў і манаграм уладальнікаў), размалёўкай каляровымі эмалямі, з 17 ст. — гравіраваннем алмазным разцом. Вытв-сць Ш.м. ў 18 ст. звязана з дзейнасцю шкляных мануфактур, створаных на базе вотчынных *гут*: *Налібоцкая шкляная мануфактура*, *Урэцкая шкляная мануфактура*, прадпрыемстваў у Гродне, Крычаве, Рагачове, Чачэрску, вёсках Новая Мыш Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл., Ілья Вілейскага р-на Мінскай вобл., Студзёная Гута Гомельскага р-на, Белая Дуброва Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл. і інш. Высокі маст. ўзровень бел. шкла таго часу ў значнай ступені абумоўлены засваеннем новых тэхнік аздаблення (гравіроўка меднымі калёсікамі, шліфоўка, разьба, унутрысценнае залачэнне, размалёўка золатам, накладныя аздобы), рэцэптуры багемскага хрусталю і рубінавага шкла, свінцовага хрусталю і англ. спосабаў яго агранкі пад мясц. назвай «у брыльянт». У дэкоры вырабаў 1-й пал. 18 ст. пераважалі гравіраваныя і разныя партрэтныя і геральдычныя выявы, манаграмы. Багатай разнастайнасцю форм і дэкору вылучалася *ўрэцка-налібоцкае шкло*. У канцы 19 ст. пачалі выпуск прадукцыі шклозаводы *«Нёман»* (гл. *Нёманскае шкло*), Барысаўскі (гл. *Барысаўскае шкло*), Целяханскі, Ганцавіцкі, Старавіцкі (Слуцкі р-н) і інш. У пач. 20 ст. пашырылася размалёўка каляровымі эма-

Да арт. **Шкло мастацкае**. В.С а з ы к і н а. Кампазіцыя «Артэфакты 1». 1980.

Да арт. **Шкло мастацкае**. Т.А р ц ё м а в а. Зямляне, ці не забудзем мы паху кветак? 1992.

лямі (матывы бел. флоры і фауны, нар. архітэктура). У 1920—30-я г. на Ш.м. ўплывалі стылеўтваральныя ідэі канструктывізму, функцыяналізму. Росквіт бел. Ш.м. пачаўся ў 1960-я г. з прыходам на шклозаводы прафес. мастакоў. У 1970—80-я г. мастакі звярталіся да стварэння выразных паводле пластыкі і каларыту унікальных рэчаў — шматфігурных дэкар. кампазіцый, вітражоў, свяцільняў, набораў посуду, імкнуліся ўвасобіць сродкамі Ш.м. тэмы грамадска значнага зместу. У станаўленні бел. школы Ш.м. значную ролю адыгралі ўкараненне ў вытв-сць арыгінальных тэхнал. вынаходніцтваў, аднаўленне і ўдасканаленне стараж. і традыц. тэхнік аздаблення шкла: ціхае выдзіманне з выкарыстаннем выбітых цвікамі малюнкаў, рэльефных узораў кары дрэў (В.*Дзівінская*, К.Вакс); рыфленне, каляровая крошка, кракле, пескаструменны дэкор на шматслаёвым шкле (Л.*Мягкова*); каляровыя ўнутр. накладкі пры

ўжыванні ціхага выдзімання і пракатнага маляванне (У.*Мурахвер*); выкарыстанне ў якасці рысункаў для тэхнікі маляванне адбіткаў сухіх траў, галінак, тканін, метал. рэчаў і інш. (В.Сазыкіна); гарачае дэкарыраванне свабодна фармаваных вырабаў тонкай сульфіднацынкавай ніццю шкла (т.зв. нёманская ніць; А.*Федаркоў*). Лепшыя работы 1990-х г. адметныя разнастайнасцю тэхнік формаўтварэння і дэкарыравання, індывід. творчых манер і стылістычных прыёмаў, багатай асацыятыўнасцю, метафарычнасцю вобразнага ладу. Сярод мастакоў і майстроў: А.*Абрамава*, А.Анішчык, М.Анішчык, Т.Арцёмава, П.*Арцёмаў*, Я.Гладкоў, Дзівінская, У.*Жохаў*, Г.Ісаевіч, Р.Клімковіч, Т.Малышава, Мурахвер, Мягкова, У.Пракоф'еў, Н.*Растоўцава*, С.*Раўдвеэ*, Сазыкіна, Г.Сідарэвіч, Федаркоў і інш.

Літ.: Шелковников Б.А. Русское художественное стекло. Л., 1969; Щапова Ю.Л. Очерки истории древнего стекловарения. М., 1983; Яніцкая М.М. Вытокі шкларобства Беларусі. Мн., 1980; Яе ж. Беларускае мастацкае шкло (XVI—XVIII стст.). Мн., 1977; Яе ж. Беларускае мастацкае шкло, XIX — пачатак XX ст. Мн., 1984; Яе ж. Гісторыя шкляной вясёлкі. Мн., 1986.

М.М.Яніцкая.

ШКЛОБЕТО́ННЫЯ КАНСТРУ́КЦЫІ, будаўнічыя канструкцыі ў выглядзе бетоннай абоймы, унутры якой на растворы ўкладзены *шклаблокі*. Выкарыстоўваюць пры будаванні святлопранікальных агароджаў (перагародак, лесвічных клетак, ліфтавых шахтаў і інш.) у жылых, грамадскіх і прамысл. будынках. Вырабляюцца на з-дзе ці выкладваюцца на месцы буд-ва.

ШКЛО́ВА АБАРО́НА 1654, баявыя дзеянні войск ВКЛ супраць рас. войск каля г. *Шклоў* у ходзе *вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67*. У жн. 1654 корпус вял. гетмана ВКЛ Я.*Радзівіла* (6—8 тыс. чал.) пад націскам маскоўскіх войск адышоў ад Оршы да Копысі і Шклова. 12 жн. да Шклова падышоў авангард ваяводы Я.К.Чаркаскага (каля 20 тыс. чал.) і напаў на варту Радзівіла, які абараняў горад. Даведаўшыся, што на дапамогу Чаркаскаму з У рухаецца ваявода А.М.Трубяцкой, Радзівіл вырашыў даць бой Чаркаскаму, які пачаў атаку. Харугвы ВКЛ, прыкрытыя з флангаў драгунамі, згрупаванымі ў ярах, пераправіліся цераз р. Шклоўка і контратакавалі. Пасля шматгадзіннага бою войскі Чаркаскага страцілі ад 3 да 7 тыс. чал. забітымі. Радзівіл страціў ад 200 да 700 чал. забітымі. Не маючы дастатковых сіл працягваць барацьбу, Радзівіл у ноч на 13 жн. загадаў войску ВКЛ адступаць на З ад Галоўчына і Барысава. 30 жн. да Шклова падышло войска Трубяцкога і пачало аблогу горада. Прыступ у ноч на 6 вер. быў адбіты. Але пасля артыл. абстрэлу, не чакаючы другога прыступу, 10 вер. горад быў здадзены.

Літ.: Сагановіч Г. Невядомая вайна, 1654—1667. Мн., 1995. С. 18.

ШКЛО́ВЫЯ ПЯСКІ́, кварцавыя пяскі, аснову якіх складае аксід крэмнію (крэменязём); выкарыстоўваюць у вытв-сці *шкла*. Якасць пяску для шкляной прам-сці нарміруецца патрабаваннямі дзярж. стандарту (ГОСТ 22551—77), у адпаведнасці з якім дапускаецца SiO_2 ад 95% для нізкіх марак да 99,8% для высокіх марак; Fe_2O_3 — 0,01—0,25%; Al_2O_3 — 0,1—4%, цяжкай фракцыі мінералаў для высокіх марак — 0,05%, для нізкіх марак — не нарміруецца. У Ш.п. памеры зярнят павінны адпавядаць 0,1—0,8 мм.

У прыродзе чыстыя кварцавыя пяскі (99,8% SiO_2) трапляюцца рэдка, таму іх атрымліваюць шляхам абагачэння. На Беларусі разведаны радовішчы шкловых і фармовачных пяскоў у Гомельскай вобл. — Ленціна ў Добрушскім р-не з агульнымі прамысловымі запасамі 12 047 тыс. т (распрацоўваецца), Лоеўскае ў Лоеўскім р-не з запасамі 133 тыс. т (пасля эксплуатацыі закансервавана) і ў Брэсцкай вобл. — Гарадная ў Столінскім р-не з запасамі 15 077 тыс. т (закансервавана).

Р.Р.Паўлавец.

ШКЛОКЕРАМІ́ЧНЫЯ МАТЭРЫЯ́ЛЫ, гл. ў арт. *Сіталы*.

ШКЛОПАДО́БНЫ СТАН, цвёрды *аморфны стан* рэчыва, які ўзнікае пры застыванні яго пераахалоджанага расплаву. Адрозненне ад інш. аморфных станаў — абарачальнасць пераходу з Ш.с. ў расплаў (*фазавы пераход* I роду) і з расплаву ў Ш.с. (шклаванне). Працэс шклавання характарызуецца тэмпературным інтэрвалам. Рэчывы ў Ш.с. ў асноўным ізатропныя, крохкія, празрыстыя. У Ш.с. можа знаходзіцца значная колькасць простых рэчываў, вокіслаў, водных растворaў, халькагенідаў, галагенідаў, карбанатаў; многія з іх з'яўляюцца асновай складанага па саставе *шкла*.

ШКЛОПАКЕ́Т, будаўнічы выраб з двух (радзей трох) лістоў шкла, якія герметычна злучаны па перыметры рамкай (абоймай). Замкнёныя поласці паміж лістамі шкла запаўняюць асушаным паветрам, што выключае іх паценне і замярзанне. Лісты шкла злучаюць склейваннем іх з метал. рамкай (напр., з прафіляванага алюмінію) або зваркай па перыметры са свінцовай паласой. Выкарыстоўваецца для шклення будынкаў.

ШКЛОПРАФІЛІ́Т, буйнагабарытныя будаўнічыя вырабы з неарміраванага ці арміраванага *шкла* швелернага або каробчатага профілю. Адрозніваюць Ш.: бескаляровы і каляровы; з гладкай, рыфленай і ўзорыстай паверхняй. Вырабляюць спосабам бесперапыннага пракату. Выкарыстоўваюць у святлопранікальных агараджальных канструкцыях будынкаў і збудаванняў.

ШКЛОСІТА́Л, неарганічны шклокрышталічны матэрыял (*сітал*), які атрымліваецца аб'ёмнай *крышталізацыяй* шкла. Складаецца з адной або некалькіх крышт. фаз (памер крышталёў да 1 мкм), якія раўнамерна размеркаваны ў шклопадобнай фазе. Ёсць таксама шлакаситалы — на аснове пераважна металург. або паліўных *шлакаў*; вырабы з іх (пліты, стужкі) вызначаюцца высокай зноса- і хім. устойлівасцю.

ШКЛОТКАНІ́НА, матэрыял, утвораны перапляценнем нітак *шкляного валакна*. Вызначаецца высокай мех. трываласцю, устойлівасцю да хім. ўздзеяння, цепла- і вільгацеўстойлівасцю, добрымі цепла- і электраізаляцыйнымі якасцямі. Недахопы — нізкая зносаўстойлівасць, дрэнная адгезія. Выкарыстоўваецца як арміруючы матэрыял пры вытв-сці шкластыкаў, як фільтравальны, тэрма- і электраізаляцыйны матэрыял.

ШКЛОЎ, горад, цэнтр Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл., на правым беразе р. Дняпро. За 30 км ад г. Магілёў. Чыг. ст. на лініі Орша—Магілёў. 16,1 тыс. ж. (2002). Прадпрыемствы цэлюлозна-папяровай (*Шклоўская папяровая фабрыка*), харч., камбікормавай, пачатковай апрацоўкі лёну (*Шклоўскі льнозавод*), буд. матэрыялаў, дрэваапр. прам-сці. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнікі архітэктуры: жылыя дамы (18, 19 ст.), будынак канторы папяровай ф-кі «Спартак» (1898), касцёл (19—20 ст.), *Шклоўская Праабражэнская царква, Шклоўская ратуша*, сінагога (2-я пал. 17 ст.), асабняк (пач. 20 ст.).

Узнік і пэўны час існаваў на месцы сучасных вёсак Стары Шклоў і Хоцімка. У пісьмовых крыніцах згадваецца С.Герберштэйнам пад 1526. У час *вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1534—37* у 1535 спалены ваяводам Шуйскім. У 16—17 ст. існаваў *Шклоўскі замак*. З сярэдзіны 16 ст. належаў Хадкевічам, з 2-й пал. 16 ст. цэнтр Шклоўскага графства. У час *Лівонскай вайны 1558—83* двойчы спалены рус. войскамі ў 1563 і 1580. У канцы 16 ст. (паводле М.А.Ткачова, пасля 1580) або пасля пажару 1668 перанесены на сучаснае месца. З сярэдзіны 17 і да 1-й трэці 18 ст. ім валодалі Сяняўскія. У 1661 у Ш. 4375 ж., 490 дамоў. Развіваўся пад абаронай магутных умацаванняў (гл. *Шклоўскія гарадскія ўмацаванні*). У пач. вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 жыхары Ш. вытрымалі доўгую аблогу, але пазней здалі горад (гл. *Шклова абарона 1654*). Летам 1655 у Ш. размяшчалася часовая стаўка рас. цара Аляксея Міхайлавіча. У кастр. 1660 горад вызвалены, пасля чаго жыхары вытрымалі яшчэ адну аблогу рас. войск. У чэрв. 1666 захоплены рас. войскамі Я.К.Чаркаскага; за «здраду» ў 1660 шклоўская шляхта саслана ў Казань. Паводле *Андросаўскага перамір'я 1667* вернуты Рэчы Паспалітай. У вер. 1708 у час *Паўночнай вайны 1700—21*

разбураны шведскімі войскамі. У 1731 перайшоў да Чартарыйскіх. З сярэдзіны 17 ст. згадваецца *Шклоўская ратуша*. 10.4.1762 Ш. атрымаў магдэбургскае права, пячатку і герб (у блакітным полі рука, якая трымае сярэбраны бязмен). Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. У 1773—77 цэнтр павета Магілёўскай правінцыі і губерні. З 1777 мястэчка, цэнтр воласці Магілёўскага пав. З 1778 уладанне С.Г.Зорыча, які заснаваў *Шклоўскія мануфактуры, Шклоўскае шляхетнае вучылішча, Шклоўскі тэатр Зорыча, Шклоўскую балетную школу, Шклоўскую музычную школу*. У 1799—1800 існаваў *Шклоўскі кадэцкі корпус*. Пасля яго смерці Ш. узяты пад апеку імператрыцы Марыі Фёдараўны, апекуном прызначаны сенатар Г.Р.Дзяржавін. У пач. 19 ст. Ш. — важны гандл. цэнтр на Беларусі, прыстань на Дняпры. У 1860—12 421 ж., 1326 дамоў, 3 прыходскія школы, бальніца, 6 цэркваў, касцёл, 2 сінагогі, 22 малітоўныя дамы, яўр. вучылішча, штогод адбываліся 2 кірмашы. У 2-й пал. 19 ст. ўладанне памешчыка Вейкава. У канцы 19 ст. Ш. купіў А.К.Крывашэін і заснаваў у 1898 кардонную (з 1908 папераробную ф-ку). У пач. 20 ст. праз Ш. пракладзена чыг. Орша—Магілёў; каля 10 тыс. ж. З 1919 у складзе РСФСР, з 1924 — у БССР. З 17.7.1924 цэнтр Шклоўскага раёна. У 1924 — 6617 ж., папяровая ф-ка «Спартак», ф-ка запалкавай саломкі «Барацьба». З 3.7.1925 горад. У 1939 — 8,1 тыс. ж. У Вял. Айч. вайну 12.7.1941 акупіраваны ням. фашыстамі, якія загубілі ў горадзе і раёне 37 504 чал., у т.л. ў Ш. ў вер. 1941 каля 3 тыс. чал. Вызвалены 27.6.1944 войскамі 2-га Бел. фронту ў ходзе *Магілёўскай аперацыі 1944*. У 1970 — 9,9 тыс. жыхароў.

А.М.Лукашэвіч (гісторыя).

ШКЛО́ЎСКАЕ МІЖЛЕДАВІКО́ЎЕ (назва ад г. Шклоў), рослаўскае міжледавікоўе, перадапошняе міжледавікоўе на тэр. Беларусі. Доўжылася ад канца *дняпроўскага зледзянення* да пач. *сожскага зледзянення*. Мяркуюць, што працягласць яго каля 50 тыс. гадоў. Характарызавалася істотнымі зменамі клімату і расл. покрыва, якія адбываліся ў 3 этапы. Кожны этап меў кліматычны оптымум (найб. цёплы клімат), што ўплывала на змену холадалюбівых бярозавых і бярозава-хваёвых лясоў на шыракалістыя і ялова-шыракалістыя лясы. Канец міжледавікоўя адзначыўся пахаладаннем, што спрыяла скарачэнню плошчаў, занятых лясамі, і пашырэнню адкрытых прастораў з разнатраўем і палынамі. Рэльеф тэр. Беларусі ў гэты час агульнымі рысамі быў падобны да сучаснага. Выразна вылучаліся контуры найб. вял. раўнін і ўзвышшаў. Значная ч. тэр. была паніжанай, слабапарэзанай, з вял. колькасцю азёр. З геал. разрэзаў Ш.м. найб. дэталёва даследаваны агаленні *Ніжнінскі роў* і каля в. Касцяшы Любанскага р-на Мінскай вобл. У час Ш.м. намножылася магутная (да 47 м) тоўшча алювіяльных, азёрных, балотных, крынічных і інш. адкладаў, якія вылучаюцца як шклоўскі гарызонт. Найб. пашыраны стараж. алювіяльныя адклады Пра-Дняпра, якія вылучаюцца як рослаўская світа. З адкладамі шклоўскага гарызонту звязаны запасы пітной вады, што выкарыстоўваюцца для водазабеспячэння Мінска і інш. бел. гарадоў.

Літ.: Еловичева Я.К. Шковские (Рославльские) межледниковые отложения Белоруссии и смежных территорий. Мн., 1979.

ШКЛО́ЎСКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала ў жн. 1941 — ліст. 1943 у Шклоўскім р-не. Складалася з 13 груп (больш за 100 чал.): в. Вял. Лазіцы (кіраўнікі М.П.Каржавін, М.Ф.Галіноўскі), в. Гавяды (Г.А.Валаснёў, П.А.Крынічка), в. Зацішша (А.А.Сякацкі), в. Лешча (В.М.Шалаеў), чыг. ст. Лотва (Ф.С.Грышчанкаў), в. Любінічы (3 групы; А.П.Гелахаў, В.Ц.Грыгор'еў, У.Ц.Гурынаў, А.Я.Казлоў, Іван Ф.Стукалаў, Іосіф Ф.Стукалаў, М.М.Юр'еў), в. Малое Міхайлава (С.Л.Шугалей), в. Мерч (Ц.А.Герасімовіч), в. Смятанічы (П.А. і Р.А.Красяковы), в. Тударава (І.В.Кананыхін, Л.Р.Камісараў). Да пач. 1942 групы аб'ядналіся ў 3 падп. арг-цыі. Падпольшчыкі трымалі сувязь з Магілёўскім патрыят. падполлем і партызанамі, з лета 1943 дзейнічалі пад кіраўніцтвам Шклоўскага падп. райкома КП(б)Б. Вялі агітацыю сярод насельніцтва, распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, збіралі, рамантавалі і перапраўлялі партызанам зброю, учынялі дыверсіі, разграмілі паліцэйскі ўчастак і маслазавод у вёсках Гарадзішча і Фашчаўка, узрывалі паравозы, вагоны, рвалі тэлеф. сувязь, разбіралі драўляныя масты і інш. За час вайны загінула 17 падпольшчыкаў.

М.Ф.Шумейка.

ШКЛО́ЎСКАЕ ШЛЯХЕ́ТНАЕ ВУЧЫ́ЛІШЧА. Засн. 24.11.1778 у мяст. Шклоў Магілёўскага намесніцтва ген.-м. С.Г.*Зорычам* (гл. Дадатак) для дзяцей збяднелай шляхты. Тэрмін навучання — 8 гадоў у 5 класах (4-ы — двухгадовы і 5-ы трохгадовы). Штат складаўся з гал. дырэктара (ён жа фундатар Зорыч), дырэктара, 2 наглядчыкаў, 5 чыноўнікаў, 14 выкладчыкаў і 2 лекараў. Прымаліся хлопчыкі з 8 гадоў шляхетнага паходжання, доказ якога пацвярджаў маршалак павета, адкуль прыбыў юнак, а для іншаземцаў патрэбны былі даравальныя граматы іх продкаў. У 1783 у вучылішчы было 50, у 1788 — больш за 100, у 1789 — больш за 200 выхаванцаў. У 1785 адбыўся 1-ы выпуск — 7 юнакоў. З канца 1780-х г. штогод выпускалася каля 20 чал. Да 1797 Ш.ш.в. падрыхтавала да службы 265 кадэтаў. Выкладаліся: Закон Божы, матэматыка, мовы, гісторыя, геаграфія, маляванне; у 5-м класе дадаткова — вышэйшая матэматыка, артылерыя, тактыка, ваен. і грамадз. архітэктура; у 3—5-м класах — ваен. *экзерцыцыя*, фехтаванне, танцы, верхавая язда, музыка. Ваен. заняткі праводзіліся па серадах і суботах. Навучанне было ваенізаванае: замест класаў былі створаны эскадрон кавалерыі з 2 узводаў (кірасірскі і гусарскі) і 3 пяхотныя роты (2 грэнадзёрскія і 1 егерская). Напачатку вучылішча размяшчалася ў драўляным памяшканні. У 1788—93 узведзены мураваны будынак (знішчаны ў 1799 у выніку пажару). Вучылішча мела бібліятэку (178 кніг на рус. мове, 743 на франц., 70 на ням., 12 на польскай, 27 на латыні), музей, карцінную галерэю (шмат копій вядомых мастакоў, арыгінальныя творы, значны збор гравюр, карцін і статуй Дрэздэнскай галерэі, малюнкі і чарцяжы), прыгонны аркестр, тэатр з балетнай трупай; дзейнічалі шпіталь і муз. каманда. Пе-

Вуліца Савецкая ў г. Шклоў.

рад будынкам вучылішча знаходзілася «карусель» — вял. адкрыты манеж, дзе выхаванцы вучыліся верхавой яздзе, а кірасірскі ўзвод наладжваў рыцарскія турніры. Паводле хадайніцтва фундатара выхаванцы ўладкоўваліся на ваен. ці цывільную службу, а з 1785 іх адразу пасля заканчэння вучобы ўзводзілі ў ранг афіцэраў. 20.1.1797 Зорыч атрымаў званне ген.-лейт. (звольнены са службы 15.7.1797), а «вучылішча Шклоўскае» паводле ўказа ад 28.3.1797 перайшло ў казённае ведамства. Пасля прыняшця Ш.ш.в. ў казну (1799) адбыліся 4 выпускі: 7 выхаванцаў накіраваны ў чарнаморскія лінейныя батальёны, 19 — у мушкецёрскія палкі, 23 у артылерыю, 32 у гарнізонныя палкі. Пасля смерці Зорыча (6.11.1799) навуч. ўстанова трапіла ў ведамства бел. губернатара П.І.Севярына, 28.11.1799 атрымала назву *Шклоўскі кадэцкі корпус*. Ш.ш.в. праіснавала да 1918 пад рознымі назвамі: Гродзенскі кадэцкі корпус (1800—07), Смаленскі кадэцкі корпус (1807—24), Маскоўскі кадэцкі корпус (1824—37) і інш.

Літ.: Лалаев [М.С.]. Исторический очерк военно-учебных заведений, подведомственных Главному их Управлению. СПб., 1880; Мельницкой Н. Сборник сведений о военно-учебных заведениях в России. Т. 1. СПб., 1857; Брыгадзін П., Лукашэвіч А. Шклоўскае шляхетнае вучылішча // Бел. мінуўшчына. 1997. № 4; Іх жа. Як шклоўскія кадэты ў Маскву трапілі // Там жа. № 6. *А.М.Лукашэвіч, А.Ф.Самусік.*

ШКЛО́ЎСКАЯ БАЛЕ́ТНАЯ ШКО́ЛА. Існавала ў канцы 18 ст. пры *Шклоўскім тэатры Зорыча*. Балетмайстры — П.Барцанці (да 1783), *Марыядзіні* (1780-я г.), М.*Пранчынскі* (1795—98). Сярод навучэнцаў прыгонныя з навакольных вёсак і кадэты Шклоўскага корпуса. Паводле сведчання сучасніка, 20 сял. дзяўчат, якія жылі разам у асобным будынку, атрымлівалі ў школе і агульную адукацыю: «практыкаваліся ў французскай гаворцы, чытанні, пісьме і лічэнні». Выхаванцы школы вызначаліся высокім прафес. майстэрствам. Сярод іх П. і К.*Азарэвічы*, К.*Буткевіч*, Я.*Чуцікаў* і інш.

ШКЛО́ЎСКАЯ МУЗЫ́ЧНАЯ ШКО́ЛА. Існавала ў канцы 18 ст. пры *Шклоўскім тэатры Зорыча*. Навучэнцы — прыгонныя са Шклова і яго наваколляў. Ігры на муз. інструментах навучалі спецыяльна запрошаныя прафес. педагогі і амаль усе музыканты, якія наведвалі Шклоў з канцэртамі. У 1782—83 музыку выкладала піяністка і спявачка Э.Саж, у 1783 — прыдворны музыкант А.Баргезі, які прыязджаў з Пецярбурга. Паводле некат. звестак, найб. здольных аддавалі вучыцца ў Пецярбург да «камер-музыканта» А.Булата. З навучаных музыцы былі створаны рагавы аркестр, «музыка шклоўскага корпуса» (24 чал.); пасля 1781 прыгонныя ўваходзілі ў тэатр. аркестр, які спачатку складаўся з іншаземцаў. З 1781 капельмайстар беларус П.Пётух вучыў вакальнаму майстэрству хлапчукоў, якія потым спявалі ў тэатр. хоры. *В.П.Пракапцова.*

ШКЛО́ЎСКАЯ ПАПЯРО́ВАЯ ФА́БРЫКА «Спартак». Засн. ў 1890 у г. *Шклоў* як кардонная і папяровая ф-ка. Выпускала драўняную масу, кардон, паперу каляровую, абгортачную шэрую фінляндскую, курыльную, папяросную, капіравальную і інш. У 1908 пераабсталявана на вытв-сць папяроснай паперы. У 1910 мела 5 паравых, 2 нафтавыя, 3 паперарэзальныя, 3 папераробныя машыны, апрэтурнае аддзяленне. Працавала ад 90 да 400 чал. У 1918 нацыяналізавана і названа «Спартак», забяспечвала паперай тытунёвыя ф-кі Масквы і С.-Пецярбурга. У Вял. Айч. вайну абсталяванне ф-кі эвакуіравана ў Кіраўскую вобл. Аднавіла работу ў Шклове ў 1947. У 1957 пабудаваны папераробны цэх. У 1975—76 установлена абсталяванне для вытв-сці падпергаменту. З 1993 адкрытае акц. таварыства. Асн. прадукцыя (2003): падпергамент, папера для гафрыравання, кардон для плоскіх слаёў, гафракардон і тара з яго, папера абгортачная, спецупаковачная, туалетная, сурвэткі і інш.

ШКЛО́ЎСКАЯ ПРААБРАЖЭ́НСКАЯ ЦАРКВА́, помнік архітэктуры эклектыкі ў г. Шклоў Магілёўскай вобл. Пабудавана ў пач. 20 ст. з цэглы. Храм крыжападобны ў плане, цэнтрычнай кампазіцыі, мае элементы стыляў псеўдавізант. і мадэрн. Над сяродкрыжжам узвышаецца вял. 8-гранны светлавы барабан, накрыты гранёным шлемападобным купалам. Паміж рамёнамі (канцамі крыжа) убудаваны 4 квадратныя ў плане 3-ярусныя вежападобныя аб'ёмы. Верхнія 8-гранныя ярусы са скразнымі праёмамі завершаны гранёнымі купаламі. Розныя вышыні аб'ёму надаюць будынку верт. дынаміку. Усе фасады вырашаны з яскрава выяўленай сіметрыяй, падкрэсленай восевым размяшчэннем уваходаў, над якімі па 2 аконныя праёмы з арачнымі завяршэннямі. Іх матыў паўтараюць вял. аркі накшталт закамараў у завяршэнні сцен. Фасады аздабляюць тонкія прафіляваныя карнізныя цягі, пілястры, плоскія нішы.

Т.В.Габрусь.

ШКЛО́ЎСКАЯ РА́ТУША, помнік архітэктуры класіцызму ў г. Шклоў Магілёўскай вобл. Пабудавана ў канцы 18 ст. ў комплексе з гандл. радамі. Ратуша — 2-павярховы, амаль квадратны ў плане мураваны будынак з вальмавым дахам, завяршаўся 2-яруснай 8-граннай вежай, увянчанай гранёным купалам са шпілем. 1-ы паверх у цэнтры быў прарэзаны шырокім праездам у двор гандл. радоў. Аднапавярховыя (з 2-павярховымі квадратнымі ў плане аб'ёмамі па вуглах і сіметрычна пастаўленым падобным да ратушы будынкам) гандл. рады разам з ратушай утваралі прамавугольны двор, які меў 3 уязныя брамы. Фасады рытмічна расчлянёны шырокімі лапаткамі, прамавугольнымі аконнымі праёмамі і паўцыркульнымі аркадамі. Гандл. рады пашкоджаны ў Вял. Айч. вайну. Адноўлена ў 2000.

У.А.Чантурыя.



Шклоўская ратуша. Чарцёж.

Шклоўская Праабражэнская царква.

Шклоўская ратуша. Сучасны выгляд.

ШКЛО́ЎСКІ Віктар Барысавіч (24.1.1893, С.-Пецярбург — 5.12.1984), рускі пісьменнік, літ.-знавец. Вучыўся ў Пецярб. ун-це. Друкаваўся з 1914. Быў блізкі да футурыстаў. Чл. *ОПОЯЗа*. Адзін з пачынальнікаў і тэарэтыкаў фармальнай школы ў літ.-знаўстве (кн. «Пра тэорыю прозы», 1925). Даследаваў гіст. суадносіны сац. быцця і вядучых ідэй у л-ры таго часу: «Мастацкая проза: Роздумы і разгляд» (1959), «Аповесці пра прозу» (т. 1—2, 1966) і інш. У аснове яго мемуарных, эпісталярных, лірычных кніг аўтабіяграфічнасць: «ZOO: Лісты не пра каханне, альбо Трэцяя Элаіза» (1923), «Гамбургскі рахунак» (1928), «Жылі-былі» (1962) і інш. Аўтар гіст. аповесцей «Мацвей Камароў — жыхар горада Масквы» (1929), «Марка Пола» (1936), «Мінін і Пажарскі» (1940), «Аповесць пра мастака Фядотава» (1955), кніг пра Л.Талстога, Ф.Дастаеўскага, У.Маякоўскага, прац па тэорыі кіно, кн. «Эйзенштэйн» (1973; Дзярж. прэмія СССР 1979), кінасцэнарыяў і інш.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—3. М., 1973—74; Избранное. Т. 1—2. М., 1983.

ШКЛО́ЎСКІ Рыгор Львовіч (1875, г.п. Парычы Светлагорскага р-на Гомельскай вобл. — 1937), дзеяч рэв. руху; адзін са стваральнікаў і кіраўнікоў Бабруйскай арг-цыі РСДРП. З 1898 вучыўся ў Бернскім ун-це. У 1903 зняволены ў Мінску ў турму, потым высланы ў Бабруйск. Дэлегат III з'езда РСДРП ад Мінскай арг-цыі. У 1909 сасланы на пажыццёвае пасяленне ў Сібір, адкуль уцёк за мяжу. У эміграцыі сакратар Бернскай секцыі бальшавікоў, у 1915 узначальваў Камісію дапамогі ваеннапалонным пры К-це замежных арг-цый РСДРП. Удзельнік Базельскага кангрэса 2-га Інтэрнацыянала (1912), Бернскай канферэнцыі замежных секцый РСДРП (1915), Кастр. рэвалюцыі 1917 у Маскве. З 1918 на дыпламат. рабоце ў Швейцарыі, Германіі. У 1924—26 заг. секцыі Наркамата РСІ СССР. З 1928 на выдавецкай і гасп. рабоце. Чл. ЦКК ВКП(б) у 1925—27. У 1937 рэпрэсіраваны, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1956.

Э.А.Карніловіч.

ШКЛО́ЎСКІ ЗА́МАК. Існаваў у 16—17 ст. у г. *Шклоў*. Пабудаваны на востраве сярод штучнага става, утворанага на р. Шклоўка (Язона). Размяшчаўся на З ад *Шклоўскіх гарадскіх умацаванняў* і быў звязаны з імі драўляным мостам «на ізбіцах», які падводзіў да замкавай брамы «з узводам» — пад'ёмным мостам «на чопах жалезных з рэфамі жалезнымі». Па перыметры замкавага двара стаялі драўляныя ўмацаванні: ад ракі, з боку «поля» — гародні, з боку горада — вастракол. У падарожных запісах кн. Багуслава Радзівіла ў Ш.з. акрамя брамы згадваюцца 2 інш. вежы. Паводле інвентара 1661, тут у цэнтры замкавага двара мелася яшчэ адна высокая драўляная вежа, прыстасаваная для артабстрэлу наваколля. У цэйхгаўзе замка захоўваліся 12 гармат, адна вялікая і 20 малых марцір, 183 гакаўніцы, 44 гранаты рознага калібру, ядры, запас пораху і інш. У гіст. крыніцах 18 ст. Ш.з. не ўпамінаецца.

М.А.Ткачоў.

ШКЛО́ЎСКІ І́ДАЛ, скульптурная выява славянскага язычніцкага бажаства. Знойдзены ў 1963 каля г. *Шклоў* Магілёўскай вобл., на беразе р. Серабранка. Датуецца 10 ст. Высечаны з пясчаніку, выш. 1,2 м, маса каля 250 кг. Тулава цыліндрычнае, ніжняя частка апрацавана як пастамент, твар мае індывід. рысы. Верагодна, быў схаваны ў зямлю мясц. язычнікамі пасля прыняцця хрысціянства. Зберагаецца ў Нац. музеі гісторыі і культуры Беларусі.

Літ.: Штыхаў Г.В. Галасы далёкіх продкаў. Мн., 1968; Яго ж. Интересная находка // Искусство. 1964. № 4.

Г.В.Штыхаў.

Шклоўскі ідал.

ШКЛО́ЎСКІ КАДЭ́ЦКІ КО́РПУС, назва *Шклоўскага шляхетнага вучылішча* з 28.11.1799 да восені 1800. Паводле ўказа ад 17.2.1800 дырэктар корпуса абавязаны быў падрыхтаваць перавод выкладчыкаў у ваен. саслоўе, «як і ў іншых кадэцкіх карпусах». Падпалк. І.Фліверк, які ўзначальваў корпус, быў падсправаздачны непасрэдна цару Паўлу I; выкладчыкі — свецкія чыноўнікі. Летам 1800 у вучылішчы налічвалася 211 выхаванцаў; 13 і 14 ліп. адбыліся апошнія выпускі афіцэраў — 60 чал. Увосень 1800 навуч. ўстанова пераведзена ў г. Гродна як Гродзенскае аддзяленне Ш.к.к. У сак. 1806 у Гродна пераведзена Віленскае вайск. вучылішча і аб'яднана з Ш.к.к. У 1807 навуч. ўстанову перамясцілі ў г. Смаленск (да 1812). Пад назвай Смаленскага кадэцкага корпуса пераводзілася ў Цвер, Яраслаўль, Кастраму, у 1818 у Маскву, дзе 3.8.1824 атрымала назву Маскоўскага кадэцкага корпуса.

Літ.: К столетию перваго Московскаго кадетскаго корпуса // Рус. архив. 1875. Кн. 2.

А.Ф.Самусік.

ШКЛО́ЎСКІ ЛЕСАПІ́ЛЬНЫ ЗАВО́Д «Д н е п р». Дзейнічаў у 1906—14 на чыг. ст. Шклоў (цяпер г. *Шклоў* Магілёўскай вобл.). Вырабляў дошкі, запалкавую саломку і лучыну для карабкоў запалак. Меў паравую машыну. У 1910 працавала 80 чал.

ШКЛО́ЎСКІ ЛЬНОЗАВО́Д. Пабудаваны ў г. Шклоў Магілёўскай вобл. ў 1929. У Вял. Айч. вайну разбураны. У 1944 пачалося буд-ва новага з-да. У 1948 пушчана 1-я лінія, у 1950 — 2-я лінія, у 1960 — цэх прамысл. падрыхтоўкі тресты, у 1970 — цэх па вытв-сці пліт з кастрыцы. У 1980-я г. часткова праведзена пераабсталяванне. З 1995 адкрытае акц. таварыства. З 2000 вырошчваюць для сваёй вытв-сці лён (на 2003 — 600 га). Асн. прадукцыя (2003) — ільноваланно.

ШКЛО́ЎСКІ РАЁН. Размешчаны на Пн Магілёўскай вобл. Утвораны 17.7.1924. Пл. 1,5 тыс. км^2. Нас. 36,3 тыс. чал. (2003), гарадскога 44,4%. Сярэдняя шчыльн. 24 чал. на 1 км^2. Цэнтр — г. *Шклоў*. Раён уключае 209 сельскіх нас. пунктаў, 12 сельсаветаў: Александрыйскі, Ардацкі, Гарадзецкі, Гарадзішчанскі, Заходскі, Каменналаўскі, Рыжкавіцкі, Славенскі, Старасельскі, Таўкачоўскі, Фашчаўскі, Чарнаруцкі.

Тэр. раёна пераважна ў межах *Аршанска-Магілёўскай раўніны*. Паверхня ўзгорыста-плато падобная з мноствам ярыста-суфазійных форм у месцах пашырэння лёсападобных парод; 65% яе на выш. 180—200 м, 33% — вышэй за 200 м. Найвыш. пункт 224 м (на ПнУ ад в. Палыкавічы). Агульны нахіл паверхні з Пн на Пд, па цячэнні Дняпра. Карысныя выкапні: торф, гліны і суглінкі, буд. пяскі і пясчана-жвіровы матэрыял. Сярэдняя т-ра студз. -7,8 °С, ліп. 17,9 °С. Ападкаў 612 мм за год. Вегетац. перыяд 185 сут. Гал. р. Дняпро (перасякае раён з Пн на Пд) з прытокамі Бярозаўка, Капуснік, Серабранка, Чарніца, Арціслаўка і інш.; ва ўсх. ч. цячэ р. Бася з прытокам Аўчоса. Глебы с.-г. угоддзяў: дзярново-падзолістыя (72,7%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (17%) і інш. Пад лесам 21,3% плошчы. Найб. лясны масіў на прыдалінным схіле ўздоўж Дняпра. Пераважаюць хваёвыя, яловыя, бярозавыя, асінавыя, дубовыя лясы; трапляюцца чорнаальховыя, шэраальхо́выя, ясянёвыя і інш. Штучныя насаджэнні (29,3%) пераважна хвойныя (хвоя, елка). Пад балотамі 2% тэр. На тэр. раёна біял. заказнікі мясц. значэння: Дуброва, Лох і Смятанка. Помнікі прыроды: рэсп. значэння — агаленне *Ніжнінскі роў* (г. Шклоў); мясц. значэння — дуброва (Шклоўскае лясніцтва), парк (г. Шклоў) і дубы чарэшчатыя (в. Тройца).

Агульная пл. с.-г. угоддзяў 78 тыс. га, з іх асушаных 6,5 тыс. га. На 1.1.2003 у раёне 21 с.-г. вытв. прадпрыемства, у т.л. 16 закрытых і 5 адкрытых акц. т-ваў, 52 фермерскія гаспадаркі, рэсп. унітарнае с.-г. прадпрыемства «Эксперым. база «Спартак» (па насенняводстве бульбы і збожжавых). Сельская гаспадарка спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёла-

гадоўлі, вырошчванні збожжавых, зернебабовых, сеяных траў, алейных культур, караняплодаў, лёну, бульбы, кукурузы. Прадпрыемствы прам-сці: цэлюлозна-папяровай (папера, кардон, тара з паперы і кардону, туалетная папера), дрэваапр. (піламатэрыялы, сталярныя, дэкаратыўныя вырабы і інш.), першаснай апрацоўкі лёну (доўгае і кароткае льновалакно, кастрапліта), буд. матэрыялаў (зборны жалезабетон, бетонныя канструкцыі, сценавыя блокі, таварны бетон і інш.), харч. (цэльнамалочныя прадукты, масла, мука, крупы, камбікармы), каап. (хлебабулачныя, кандытарскія, мясныя вырабы, безалкагольныя напіткі, пашыў спецвопратку, вырошчванне с.-г. прадукцыі, адкорм буйн. раг. жывёлы і свіней) і інш. Па тэр. раёна праходзяць: чыгунка Віцебск—Орша—Мінск—Брэст, аўтастрада С.-Пецярбург—Адэса, аўтадарогі Шклоў—Круглае, Шклоў—Горкі, Шклоў—Бя-



лынічы, Орша—Магілёў і інш. У раёне 12 сярэдніх, 4 базавыя, 4 пач. школы, спецшкола-інтэрнат для сляпых і са слабым зрокам дзяцей, дзіцячая школа мастацтваў, 2 вучэбна-вытв. камбінаты, Цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, Цэнтр пазашкольнай дзейнасці, Цэнтр адпачынку моладзі, 5 комплексаў «школа-сад», 16 дзіцячых садкоў, 29 дамоў культуры і клубаў, 35 б-к, 5 бальніц, 2 паліклінікі, 3 амбулаторыі, 24 фельч.-ак. пункты, раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі. Музеі: Шклоўскі краязнаўчы музей, музей прац. і баявой славы калгаса імя Фрунзе (в. Любінічы) і райаграпрамтэхнікі (г. Шклоў), дом-музей кінаакцёра П.М.*Алейнікава* (в. Крывель). Помнікі архітэктуры: Пакроўская царква ў в. Вялікія Лазіцы (19 ст.), паштовая станцыя (сярэдзіна 19 ст.) каля в. Лакуці, царква (1903) у в. Старое Высокае. Выдаецца газ. «Ударны фронт».

А.М.Бялясаў, Р.Р.Паўлавец.

ШКЛО́ЎСКІ ТЭ́АТР ЗО́РЫЧА, тэатральная трупа графа С.Г.Зорыча ў г. Шклоў Магілёўскай вобл. Існаваў у 1778—1800. Складаўся з прыгонных спевакоў, драм. акцёраў і музыкантаў-інструменталістаў (рагавы аркестр, «хатняя музыка» і «музыка шклоўскага корпуса»), да якіх далучаліся аматары, навучэнцы кадэцкага корпуса і гастралёры-іншаземцы. Паказы адбываліся ў спец. тэатр. будынку (пабудаваны ў 1780) і ў залах пры аранжарэі.

У рэпертуары алегарычныя балеты з харамі, міфалагічныя пантамімы, камедыі і трагедыі, камічныя оперы Э.Ванжура, Б.Галупі, Дж.Паізіела, Дж.Сарці, Д.Чымароза. Сярод спевакоў: І.Варэнік, І.Духаў, В.Жуйка, Р.Пажадаік, С.Патанчык, А.Рак, Л.Трушкоў. З 1781 хормайстар П.Пётух. У 1782—83 працаваў рэжысёр, лібрэтыст і кампазітар Т.А.Г. дэ Салмаран. У балетах танцавалі навучэнцы *Шклоўскай балетнай школы*, кадэты шклоўскага корпуса (да 1798). Сярод салістаў з прыгонных: П. і К. Азарэвічы, Г. і Р. Бекеры, К.Буткевіч, М.Бушынская, Г.Максімовіч (Ласімовіч), Я.Палітыка, Н.Соніна, К.Скорабагаты, Л.Суворава, Я.Чуцікаў, Ф.Шамборскі, А.Янкілевічава. Лепшыя салісты ў 1800 перададзены ў балетную трупу Пецярб. імператарскіх тэатраў.

У складзе «хатняй музыкі» (з 1780) былі ням. і чэш. музыканты, потым і прыгонныя. У 1783—1800 патрэбы тэатра і кадэцкага корпуса задавальняў прыгонны аркестр з 24 чал. (разам з корпусам перададзены ў Маскву). Сярод мастакоў: Барцанці (1780), А.Главацкі (каля 1787), Р.К.Зомер (1783), прыгонныя Д.Фёдараў (1783), К.Русаў (1798).

Літ.: Б а р ы ш а ў Г. Гісторыя «графства Шклоўскага», або Як зазначаў А.С.Пушкін, «Зорыч быў надта просты...» // Мастацтва. 1999. № 6.

ШКЛО́ЎСКІЯ ГАРАДСКІ́Я ЎМАЦАВА́ННІ. Існавалі ў г. *Шклоў* з апошняй чвэрці 16 да канца 18 ст. Шклоў быў абаронены магутнымі ўмацаваннямі, пры буд-ве якіх удала выкарыстаны штучныя і натуральныя водныя рубяжы. З У горад быў надзейна прыкрыты Дняпром, які тут дасягае шыр. больш за 150 м; з Пд і З працякала р. Шклоўка; у выніку пабудовы на ёй дамбы і плацiны ўтварылася вял. возера, якое прыкрывала горад і *Шклоўскі замак*. Шклоў быў абкружаны магутным земляным валам, на якім стаяў «паркан з дрэва, пабудаваны ізбіцамі, з вежамі і брамамі». Гіст. дакументы за 1647 называюць 4 брамы горада: Копыскую, Магілёўскую, Галоўчынскую, Астроўскую. З паўн. боку Шклоў не меў натуральных умацаванняў, таму акрамя земляного вала тут быў выкапаны абарончы роў. Агульная даўжыня гар. умацаванняў складала больш за 2240 м. Паводле апісання Ш.г.у. у 1657 ваяводам І.М.Талачанавым, горад быў абаронены 26 драўлянымі вежамі розных памераў і канструкцый. Уласна вежаў было 14, у т.л. 3 брамы. На сценах горада стаялі «кобылины на вертлюгах» (цяжкія мушкеты, што стралялі буйным шротам і сечаным жалезам), 20 палкавых гармат і 20 грахаўніц, 93 пішчалі заціннyя, мушкеты і ручніцы з запасам ядраў, куль, волава і свінцу. У вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 Ш.г.ў. моцна пацярпелі. Пазней яны адноўлены і, паводле дакументаў 18 ст., уключалі вал, 5 драўляных вежаў і 7 рэдутаў. Агульная даўжыня гар. фартыфікацыйнай лініі складала 2750 м. Рэшткі Ш.г.у. існавалі да канца 18 ст., часткова захаваліся да пач. 20 ст. У наш час іх сляды ў выглядзе разбураных бастыёнаў бачны ў прыдняпроўскай частцы горада.

М.А.Ткачоў.

ШКЛО́ЎСКІЯ МАНУФАКТУ́РЫ, прамысловыя прадпрыемствы, заснаваныя ў канцы 18 ст. графам С.Г.*Зорычам* (гл. Дадатак) у г. *Шклоў*. Працавалі пераважна на мясц. сыравіне, абслугоўвалі патрэбы вотчыннага двара і выраблялі прадукцыю на продаж. Пасля смерці Зорыча (1799) большасць мануфактур спыніла існаванне.

Шаўкаткацкая мануфактура (1781—99) вырабляла шаўковую тафту, шаўковыя паясы, камзолы, шытыя золатам, і інш. У 1797 мела 30 ткацкіх станкоў, працавала больш за 50 чал. Сыравіну і розныя матэрыялы куплялі ў Італіі. Канатная мануфактура (1790—99) вырабляла канаты і пражу з ільняной кудзелі і пянькі. У 1797 працавала больш за 50 чал., выраблена канатаў агульнай даўж. 10 тыс. сажняў. Гарбарная мануфактура (1794—98) вырабляла скуры англ., простыя, падэшвенныя, замшавыя, апойкавыя. У 1796 працавалі 53 чал., мела 20 чанаў, выраблена 6 тыс. скур. Парусінавая мануфактура (1794—1845) вырабляла тонкае і ветразевае палатно. Размяшчалася ў мураваным 2-павярховым будынку. У 1797 працавала 255 чал., мела 138 ткацкіх станкоў. Сыравіну (пяньковыя ніткі і пяньку) набывалі ў мясц. сялян. Суконная мануфактура дзейнічала ў в. Путнікі ў 1781—1809. Вырабляла сукно з белай воўны. У 1797 працаваў 121 чал., мела 12 станаў, выраблена сукна 267 кускоў.

А.М.Лукашэвіч.

ШКЛЯНА́Я ПЛІ́ТКА, мазаічная дробная (звычайна квадратная) абліцовачная плітка. Вырабляецца з непразрыстага каляровага *шкла*. Выкарыстоўваецца для ўнутр. і вонкавай абліцоўкі будынкаў і збудаванняў (гл. *Абліцовачныя работы*), а таксама для дэкаратыўнамаст. мазаічных работ. Гл. таксама *Смальта*.

ШКЛЯНА́Я ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, галіна прамысловасці, прадпрыемствы якой вырабляюць буд. і тэхн. шкло, гатунковы посуд і маст. вырабы са шкла і хрусталю, шклаблокі, шклатару і інш. вырабы. Найб. развітую Ш.п. маюць ЗША, Вялікабрытанія, Польшча, Італія, Германія, Чэхія, Кітай, Расія.

На Беларусі вытв-сць шкла — адна са старэйшых галін прам-сці. У 16 ст. на Гродзеншчыне, у Оршы меліся гуты па выпуску прасцейшых шкляных вырабаў. Першыя мануфактуры, на якіх выраблялася ліставое шкло, люстры, графіны, шклянкі, з'явіліся ў пач. 18 ст. (*Налібоцкая шкляная мануфактура, Урэц-*

кая шкляная мануфактура). Шкляныя вырабы пастаўляліся для аздаблення радзівілаўскіх палацаў. У 1913 на Беларусі дзейнічалі 23 прадпрыемствы Ш.п. Найбуйнейшыя з іх ф-кі хрусталю «Нёман А» і «Нёман Б» ва ўрочышчы Устронь Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. (гл. *Нёманскія шклозаводы*), *Ноўкінскі шклозавод* у в. Ноўка Віцебскага р-на, *Целяханскі шклозавод* у г.п. Целяханы Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл., *Барысаўскі хрусталёвы завод* у г. Барысаў Мінскай вобл. і інш. Асн. прадукцыяй іх былі хрустальныя вырабы, хім. і аптэкарскі посуд, лямпавае і ліставое шкло і інш. вырабы. Першы механізаваны шклозавод на Беларусі пабудаваны каля Гомеля ў 1933 (гл. *Гомельскі шклозавод*) праведзена рэканструкцыя шэрагу былых гут. У час Вял. Айч. вайны многія заводы Ш.п. былі разбураны і пасля вайны не адноўлены (шклозавод у Мінску, «Ноўка» пад Віцебскам і інш.).

На 1.1.2003 на Беларусі 9 прадпрыемстваў Ш.п., 2 люстэркавыя фабрыкі і шэраг вытв-сцей па апрацоўцы шкла. Найбольшыя з іх «Гомельшкло» ў р.п. Касцюкоўка Гомельскага р-на, якое вырабляе аконнае, вітрыннае, загартаванае шкло, трыплекс для легкавых і грузавых аўтамабіляў, трактароў «Беларусь» і інш. трансп. сродкаў, шкло для мэблі, газавых і эл. пліт, пенашкло (гукаізаляцыйны матэрыял). Шклозавод *«Нёман»* у г. Бярозаўка Лідскага р-на Гомельскай вобл. выпускае сартавы посуд і вырабы з хрусталю шырокага асартыменту. Барысаўскі хрусталёвы з-д спецыялізуецца на вырабе поўных набораў для сервіроўкі стала з хрусталю бясколернага шкла, маст. вырабаў, сувеніраў, электраарматурнага шкла для свяцільнікаў. *Гродзенскі шклозавод* выпускае бутэлькі для шампанскіх він, піва, арміраванае і ўзорыстае шкло, шклаблокі. На выпуску бутэлек спецыялізуюцца таксама шклозаводы *«Залессе»* ў Вілейскім р-не Мінскай вобл., «Шкло-Глуша» ў р.п. Глуша Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл., шкляную тару для кансервавання вырабляюць шклозавод «Кастрычнік» у г.п. Ялізава Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл. і «Гута» ў в. Галбея Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. У г. Ліда Гродзенскай вобл. дзейнічае з-д «Белеўратара», які вырабляе бутэлькі з бясколернага шкла. У Мінску і Гомелі працуюць люстэркавыя фабрыкі.

Прадукцыя Ш.п. выкарыстоўваецца на Беларусі і экспартуецца. У 2001 на экспарт пастаўлена шкла і шкляных вырабаў на 106,4 млн. дол., у т.л. на 33,5 млн. ў краіны СНД (Расія, Украіна, Малдова) і на 72,9 млн. за межы СНД (Германія, Грэцыя, Нідэрланды, Балгарыя, Польшча і інш.). Імпарт у Беларусь шкла і вырабаў з яго ў 2001 склаў 36,3 млн. дол., у т.л. з краін СНД 23,8 млн. і з-за межаў СНД 12,5 млн.

Літ.: Промышленность Республики Беларусь: Стат. сб. Мн., 2002. *П.І.Рогач.*

ШКЛЯНО́Е ВАЛАКНО́, штучнае валакно, якое вырабляюць з расплаўленага *шкла*. Бывае неперарыўнае (даўж. да 10 000 м) і штапельнае (0,01—0,5 м). Вызначаецца высокімі хім.- і цеплаўстойлівасцю, дыэлектрычнымі ўласцівасцямі, мех. трываласцю, нізкай цеплаправоднасцю. Выкарыстоўваюць на выраб *шклотканіны*, *шклапластыкаў*, фільтраў для агрэсіўных растворaў, святлоправодаў, як электра-, цепла-, гукаізаляцыйны матэрыял.

ШКЛЯНЫ́Я РАБО́ТЫ, устаўлянне шкла і шклавырабаў у светлавыя праёмы (вокны, дзверы, вітрыны, светлавыя ліхтары), агараджальныя канструкцыі будынкаў і збудаванняў; від *аддзелачных работ*.

Адрозніваюць зашкленне звычайным і буйнапамерным вітрынным шклом, шклаблокамі і шклопакетамі. Ш.р. складаюцца з нарыхтоўкі шкла (наразанне па памерах), устаноўкі і замацавання ў канструкцыях. Спосабы ўстаноўкі і замацавання залежаць ад віду зашклення, матэрыялаў, памераў праёму і інш. Асн. інструменты для Ш.р. — *шкларэзы*, лінейкі, стамескі, нажы і інш.; для мантажу вітрыннага шкла карыстаюцца спец. аўтапад'ёмнікамі, грузазахопы якіх маюць вакуумныя прысоскі.

ШКЛЯР Абрам Хаімавіч (27.9.1910, в. Магільна Уздзенскага р-на Мінскай вобл. — 1.1.1977), бел. географ і кліматолаг. Д-р геагр. н. (1964), праф. (1965). Скончыў БСГА (1931). У 1940—41 і з 1946 выкладчык, з 1974 заг. кафедры ў БДУ. Навук. працы па с.-г. кліматалогіі, феналогіі, ахове прыроды, фіз. геаграфіі Беларусі, па меліярацыі Палесся. Аўтар дапаможнікаў па геаграфіі для ВНУ Беларусі. Удзельнічаў у складанні Атласа БССР.

Тв.: Прырода Беларусі: (Фізіка-геагр. агляд). Мн., 1959 (разам з В.А.Дзяменцьевым, В.П.Якушка); Сезонное развитие природы Белоруссии. Мн., 1959; Климатические ресурсы Белоруссии и использование их в сельском хозяйстве. Мн., 1973; Календарь природы Белоруссии. 2 изд. Мн., 1979.

Вытворчасць шкла на Беларусі па відах бутэлек і шклатары для кансервавання

Прадукцыя	Адзінка вымярэння	1990	1995	2001
Шкло будаўнічае	тыс. м^2	12117	6204	1297
Шкло паліраванае	-"-	—	—	17919
Шкло трохслойнае безасколачнае (трыплекс)	-"-	—	33	70
Шкло загартаванае	-"-	1007	247	200
Шкло ўзорыстае	-"-	1880	349	764
Шкло арміраванае	-"-	106	104	309
Шкло электраарматурнае	тыс. шт.	2822	962	688
Бутэлькі	млн. шт.	72,4	137,9	153,2
Шклатара для кансервавання (у вымярэнні 0,5 л)	-"-	170,3	41,6	147,6

ШКЛЯР Аркадзь Ханонавіч (н. 1.12.1949, Мінск), бел. вучоны ў галіне педагогікі. Д-р пед. н. (1997), праф. (2000). Скончыў БПІ (1972). З 1974 у сістэме прафес.-тэхн. адукацыі (майстар вытв. навучання, нам. дырэктара, дырэктар ПТВ, Мінскага вышэйшага прафес. вучылішча, Вышэйшага тэхн. вучылішча). З 1992 рэктар Рэсп. ін-та прафес. адукацыі. Навук. працы па праблемах бесперапыннай прафес. адукацыі, тэорыі і методыкі вытв. навучання ва ўмовах шматузроўневай падрыхтоўкі. Распрацаваў комплексную сістэму падрыхтоўкі кадраў па схеме «ПТВ — тэхнікум — ВНУ», якая пакладзена ў аснову стварэння інтэграваных шматузроўневых навуч. устаноў бесперапыннай прафес. адукацыі ў краінах СНД.

Тв.: Непрерывное профессиональное образование в интегративных структурах профессиональной школы (теория и практика). Мн., 1995; Методологические подходы к исследованию подготовки работающего и безработного населения. Мн., 1996 (разам з У.П.Пабядзімскім); Педагогическая система производственного обучения в условиях непрерывной многоуровневой подготовки. Мн., 2000; Основы мониторинга качества профессионального образования. Мн., 2001 (у сааўт.); Научные основы управления качеством профессионального образования. Мн., 2001 (у сааўт.); Основные положения теории профессионального образования. Мн., 2003 (у сааўт.).

ШКЛЯР Міхаіл Яўхімавіч (7.10.1916, в. Магільна Уздзенскага р-на Мінскай вобл. — 10.1.1978), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (1961), праф. (1963). Засл. дз. нав. Беларусі (1972). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1941), Вышэйшую парт. школу пры ЦК ВКП (б) (1947). З 1941 працаваў у ЦК ЛКСМБ, з 1947 у Ін-це гісторыі партыі пры ЦК КПБ, з 1963 на пед. рабоце ў БДУ, Ін-це павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук пры БДУ (з 1975 заг. кафедры). Асн. працы па гісторыі КПБ. Адзін з аўтараў «Гісторыі Беларускай ССР» (т. 2, 2-е выд. 1961), кн. «Перамога Савецкай улады ў Беларусі» (1967), «Нарысаў гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі». (ч. 1, 2-е выд. 1968; ч. 2, 1967), «Курса лекцый па гісторыі КПСС» (ч. 1—2, 1971), зб. «Дзейнасць Кампартыі Беларусі ў перыяд сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва» (1969).

Тв.: Бальшавікі Беларусі ў першай рускай рэвалюцыі. Мн., 1955 (разам з М.М.Мяшковым, У.В.Скорабагатым); Борьба Компартии Белоруссии за укрепление союза рабочего класса и трудящегося крестьянства в восстановительный период (1921—1925 гг.). Мн., 1960; Белорусская ССР — одна из учредительниц Союза ССР. Мн., 1972.

ШКЛЯРЭ́ЎСКІ Ігар Іванавіч (н. 25.6.1938, г.п. Бялынічы Магілёўскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў Літ. ін-т імя М.Горкага ў Маскве (1965). З 1965 жыве ў Маскве. Друкуецца з 1955. Піша на рус. і бел. мовах. У паэт. зб-ках «Я іду!» (1962), «Лодка» (1964), «Фарту-

на» (1968), «Рэўнасць» (1974), «Пахаладанне» (1975), «Неназваная сіла» (1978), «Госць» (1980), «Тайнік» (1981), «Слухаю неба і зямлю» (1985, Дзярж. прэмія СССР 1987) і інш. роздум над складанымі духоўнымі, экалагічнымі праблемамі сучаснасці, гісторыяй слав. адзінства, над лёсам роднай культуры, тэмы пасляваен. дзяцінства, кахання, чарнобыльскай бяды. Аўтар паэмы «Слова пра Кулікова поле» (1982), кн. прозы «Цень птушкі» (1976), нататак пра л-ру

І.І.Шклярэўскі.

«Паэзія — львіца з грывай» (1986) і інш. Пераклаў на рус. мову «Слова аб паходзе Ігаравым», «Песню пра зубра» Міколы Гусоўскага, асобныя вершы Я.Купалы, М.Багдановіча, Р.Барадуліна, П.Броўкі, Г.Бураўкіна, А.Вялюгіна, П.Панчанкі, А.Пысіна, М.Танка і інш.

Тв.: Избранное: Стихотворения и поэмы. М., 1984; Избранное: Стихотворения; Поэмы; Заметки о поэзии и природе; Тень птицы: Повесть. М., 1990; Мне все понятней облака: Стихи, поэмы, «Слово о полку Игореве», заметки о поэзии и природе. М., 1990; Стихотворения. М., 1997; Загадки и тайны «Слова о полку Игореве». М., 1998. *Л.М.Гарэлік.*

«ШКО́ДА» (Škoda), сям'я легкавых аўтамабіляў аднайм. чэшскай фірмы. Выпускаюцца з 1925. Маюць 4-дзверны 5-месны кузаў хэтчбэк або універсал, бензінавы рухавік магутнасцю да 55 кВт, найб. скорасць да 160 км/гадз.

Пярэднепрывадны хэтчбэк «Шкода» мадэлі «Феліцыя».

ШКО́ДНАЯ ЧАРАПА́ШКА (Eurygaster intergriceps), насякомае атр. клапоў, шкоднік збожжавых злакаў. Пашкоджвае азімую і яравую пшаніцу, жыта, ячмень і інш. Пашырана паўсюдна ў зонах вырошчвання збожжавых культур.

Даўж. 12 мм. Цела цёмна-карычневае, шырокаавальнае, пукатае; шчыток цалкам укрывае брушка. Німфы Ш.ч. падобныя да дарослых клапоў, маюць меншыя памеры. Зімуюць імага ў лясах пад лісцевым подсцілам. Актыўны перыяд — 3—4 мес (з сак.—крас.), калі клапы нападаюць на злакі. Самкі адкладваюць яйцы на лісце раслін. Шкодзяць дарослыя клапы і лічынкі: праколваюць сцёблы злакаў і высмоктваюць клетачны сок. Пашкоджаныя расліны вянуць, жаўцеюць, марудна растуць; зніжаюцца якасць і колькасць прадукцыі.

ШКО́ДНІКІ ЗБО́ЖЖА І ЗБОЖЖАПРАДУ́КТАЎ, свірнавыя шкоднікі, жывёлы, якія пашкоджваюць і знішчаюць збожжа і збожжапрадукты пры захоўванні і транспарціроўцы. Больш за 100 відаў. На Беларусі каля 60 відаў (кляшчы, насякомыя, грызуны, птушкі). Найб. небяспечныя: *мучны клешч* і інш. *свірнавыя кляшчы, свірнавыя агнёўкі*, прытворшчык-злодзей, гарохавы зерняед, вяндлінны скураед, вялікі мучны хрушчак, зерневая моль, *свірнавая моль*, свойскі голуб, дамавы верабей, шэры і чорны пацукі, дамавая мыш, палёўкі.

Знішчаюць ураджай, пагаршаюць яго якасць, памяншаюць усходжасць насення, забруджваюць прадукты, пераносяць узбуджальнікаў хвароб раслін, жывёл і чалавека (цвёрдай галаўні, тулярэміі, бруцэлёзу і інш.). Меры барацьбы прафілакт. (абеззараджванне тары і сховішчаў, прасушванне збожжа, захаванне сан. рэжыму) і знішчальныя (*дэзінсекцыя, дэратызацыя*, знішчэнне гнёздаў шкоднікаў і інш.).

Літ.: Марковец А.Ф. Амбарные вредители и меры борьбы с ними. Мн., 1980.

ШКО́ДНІКІ ЛЁСУ, жывёлы, якія пашкоджваюць лясную расліннасць. Тэрмін «Ш.л.» адносны, ужываецца ў дачыненні да гасп. карысці чалавека. Сярод Ш.л. найб. пашыраны насякомыя, у меншай ступені — некат. кляшчы (плоскія, павуцінныя і эрыяфізы), круглыя чэрві (афеленхіды, тыленхіды і паратыленхіды), слімакі, птушкі і млекакормячыя (грызуны, ласі, казулі, дзікі). Пашырэнне і шкаданоснасць асобных Ш.л. залежыць ад іх біял. асаблівасцей, ступені ўстойлівасці раслін, антрапагеннага фактару і інш. Паводле характару харчавання адрозніваюць Ш.л. каранёвых, пупышак і парасткаў, ігліцы і лісця, пладоў і насення, стваловых, тэхн. (жывяцца мёртвай драўнінай) і інш.

Шкодная чарапашка: 1 — дарослы клоп; 2 — кладка яец; 3 — клапы на пашкоджанай расліне.

Каранёвыя Ш.л. — лічынкі *майскіх хрушчоў* (усх. і зах.), хрушчоў чэрвеньскага і мармуровага, *драцянікі, мядзведка* звычайная. Пупышкі і парасткі розных відаў хвоі выгрызаюць вусені парасткаўюноў летняга, зімуючага, пупышкавага і *смалёвак*. Значную шкоду прычыняюць жукі вялікага і малога хваёвых даўганосікаў, жукі і лічынкі таполевага, асінавага, альховага *лістаедаў*, дубовай *блошкі*. Асабліва шматлікія і разнастайныя ігліца- і лісцегрызучыя Ш.л.: вусені матылёў, лічынкі хваёвых *пільшчыкаў* і пільшчыкаў-ткачоў (ім уласцівы перыяд. ўспышкі масавага размнажэння). У хвойных лясах найб. небяспечныя шаўкапрад-манашка, хваёвыя *коканапрад, соўка* і *пядзенікі*, звычайны і рыжы хваёвыя пільшчыкі, зорчасты пільшчык-ткач; у дубровах — зімовы пядзенік, пядзенік-абдзірала, зялёная дубовая ліставёртка; у лісцевых насаджэннях — кольчаты шаўкапрад, вярбовая *ваўнянка, залатагузка*, дубовая хахлатка і лунка серабрыстая. Шкоднікі пладоў і насення пашкоджваюць генератыўныя органы дрэвавых пародаў: шышкі і насенне хвоі і елкі — шышкавая смалёўка і *агнёўка*, ліставёртка; жалуды — жалудовыя даўганосік і пладажэрка. Лічынкі стваловых Ш.л. засяляюць аслабленыя дрэвы, робяць хады ў драўніне, пашкоджваюць кару. Да іх належаць: вялікі і малы *лубаеды*; *карабеды* шасцізубы, тыпограф, двайнік і гравёр; вузкацелыя *златкі* і інш.

Прафілакт. меры барацьбы з Ш.л. — выгрымліванне агратэхнікі, догляд за насаджэннямі, сістэма высечак, падбор устойлівых сартоў і інш. Выкарыстоўваюць хім. (*інсектыцыды, феромоны*, атрактанты), біял. (паразіты-яйцаеды, драпежныя энтамафагі), мікрабіял. (бактэрыяльныя і вірусныя прэпараты), мех. і інш. метады барацьбы са Ш.л.

Літ.: Аверкиев И.С. Атлас вреднейших насекомых леса. 2 изд. М., 1984; Воронцов А.И., Мозолевская Е.Г., Соколова Э.С. Технология защиты леса. М., 1991; Харитонова Н.З. Лесная энтомология. Мн., 1994; Хотько Э.И., Марченко Я.И., Шаванова Т.М. Атлас насекомых-вредителей лесных пород в Беларуси. Мн., 1999. *Э.І.Хацько.*

ШКО́ДНІКІ СЕЛЬСКАГАСПАДА́РЧЫХ КУЛЬТУ́Р, жывёлы, якія пашкоджваюць культурныя расліны. Каля 60 тыс. відаў; пераважна насякомыя, таксама кляшчы, слізні, чэрві, птушкі і млекакормячыя (грызуны). На Беларусі каля 500 відаў. Найб. небяспечныя Ш.с.к.: мнагаедныя — азімая соўка, шчаўкуны, лугавы матылёк; збожжавых культур — *шведскія мухі*, п'явіца чырванагрудая, *зеленавочка*, вялікая злакавая тля, трыпсы; зернебабовых — парасткавая муха, гарохавы зерняед, гарохавая пладажэрка, клубеньчыкавыя даўганосікі, бабовая тля. Пасевы бульбы псуюць *каларадскі бульбяны жук* і яго лічынкі, лічынкі шчаўкуноў; усходы лёну — земляныя *блошкі*; агароднінныя культуры — муха капусная, *бялянкі*, капусныя соўка і тля, маркоўная і цыбульная мухі, парасонавая моль, цы-

бульны скрытахобатнік; у ахаваным грунце — звычайны павуцінны клешч, белакрылка цяплічная, *тлі*. Усходы цукр. буракоў пашкоджваюць звычайная бураковая блыха, матавы мерцвяед, лісце — лічынкі бураковай мініруючай мухі і бураковая тля. Пладовым культурам шкодзяць *яблыневая пладажэрка, молі* і кветкаед, тлі, *пядзенікі, лістаеды, слівавая пладажэрка*. Значную шкоду прычыняюць бульбяная, сцябловая, бураковая і інш. нематоды (гл. *Нематодныя хваробы раслін*).

Меры барацьбы са Ш.с.к.: агратэхн. (правільны севазварот, барацьба з пустазеллем і інш., мех. (пасткі, знішчэнне кладак), хім. (*акарыцыды, інсектыцыды*), біяхім. (феромоны, антыметабаліты), біял. (паразіты, драпежнікі) і інш. Гл. таксама *Шкоднікі збожжа і збожжапрадуктаў*.

Літ.: Справочник по защите сельскохозяйственных растений от вредителей, болезней и сорняков. 2 изд. Мн., 1983. *В.Л.Мароз.*

ШКО́ДЭР, другая назва *Скадарскага возера*.

ШКО́ЛА (лац. schola ад грэч. scholē), навучальна-выхаваўчая ўстанова для навучання дзяцей, моладзі і дарослых. Займае асн. месца ў сістэме *адукацыі*. Падзяляецца: паводле характару даваемых ведаў — на агульнаадук. і прафес.; паводле аб'ёму ведаў і ўзросту навучэнцаў — на пачатковыя, сярэднія і вышэйшыя (бываюць агульнаадук. пачатковыя і сярэднія Ш. для дарослых); у адносінах таго, хто ўтрымлівае школы, — на дзярж., муніцыпальныя (грамадскія) і прыватныя; паводле полу вучняў — на сумесныя (для вучняў абодвух палаў) і раздзельныя (мужчынскія і жаночыя); па часе знаходжання ў Ш. — на Ш. для дзяцей, якія прыходзяць, і Ш. для дзяцей, якія ў іх жывуць (пансіёны, інтэрнаты, *школы-інтэрнаты*); па адносінах да рэлігіі — на свецкія і канфесіянальныя (навучаюцца дзеці, якія належаць да пэўнага веравызнання). Працуюць таксама спец. Ш. для дзяцей з дэфектамі псіхафіз. развіцця. Змест навучання ў Ш. вызначаецца яе планамі, праграмамі і прынятымі ў дадзенай Ш. падручнікамі. Агульнаадук. Ш. падзяляецца на пачатковую (3—4 гады), няпоўную сярэднюю (базавую, 7—9 гадоў), сярэднюю (10—12 гадоў). У Ш. 1-й ступені закладваюцца асновы развіцця, вучні набываюць неабходныя веды і навыкі навуч. дзейнасці (выпрацоўваюцца ўменне і навыкі чытання, пісьма, лічэння, даюцца першапач. веды аб прыродзе і грамадстве; навуч. план уключае родную мову, арыфметыку, прыродазнаўства, маляванне, спевы, фіз. падрыхтоўку, ручную працу). У Ш. 2-й ступені ствараецца падмурак агульнаадук. падрыхтоўкі. Сярэдняя Ш. завяршае агульнаадук. падрыхтоўку вучняў, побач з ёй можа даваць спец. (прафес.) адукацыю. Сярэдняя адукацыя звычайна ахоплівае больш шырокія і сістэм. курсы мовы і л-ры, алгебру, геаметрыю, фізіку, хімію, замежныя мовы, геаграфію, гісторыю і некат. інш. прадметы. Вышэйшая Ш. будуецца на аснове агульнай ці спец. сярэдняй адукацыі і ўключае сукупнасць ведаў, неабходных для спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі пэўнай галіны гаспадаркі і культуры. Тэрмін навучання ў ВНУ 4,5—5 гадоў (завочных 6), прымаюцца асобы, якія маюць сярэднюю адукацыю і вытрымалі іспыты. Гал. метады працы: лекцыі, семінарскія заняткі, курсавыя работы, навуч. і вытв. практыка, дыпломныя работы. У навучанне ўваходзяць грамадскія, агульнанавук. і спец. цыклы прадметаў (гл. *Акадэмія, Вышэйшая адукацыя, Вышэйшыя навучальныя ўстановы, Універсітэт*).

Ш. ўзніклі ў краінах Стараж. Усходу — Вавілоне, Егіпце, Індыі, Кітаі і інш.; каля 6 ст. да н.э. — у Стараж. Грэцыі, каля 4 ст. да н.э. — у Стараж. Рыме; у 4 ст. н.э. — у Грузіі і Арменіі, у 10 ст. — у Кіеўскай Русі. У сярэднія вякі ў Зах. Еўропе большасць Ш. належала царкве — *манастырскія школы, саборныя школы*, парафіяльныя, епіскапскія і інш. У іх навучаліся толькі хлопчыкі. З развіццём рамяства і гандлю ў гарадах Зах. Еўропы з'явіліся *цэхавыя школы, бюргерскія школы*, гільдзейскія і інш. Для дзяцей дваранства адкрываліся арыстакратычныя Ш., напр., рыцарскія акадэміі ў Германіі, Францыі, *каледжы* ў Англіі. У 16 ст. ўзніклі сярэднія Ш. — *гімназіі*, у 18 ст. — рэальныя вучылішчы (гл. *Рэальныя навучальныя ўстановы*). Вышэйшыя Ш. з'явіліся ў Стараж. Грэцыі і Рыме, першыя ун-ты — у 11—13 ст. у Італіі, Францыі, Іспаніі. У пач. 18 ст. ў Рас. імперыі ствараліся пач. Ш. — архірэйскія, цыфірныя, гарнізонныя; павышаныя пач. і сярэднія — граматычныя Ш., духоўныя семінарыі, спец. Ш. (артыл., інж., хірург. Ш., марская акадэмія). У канцы 18 ст. ў пав. гарадах арганізаваны *малыя народныя вучылішчы*, у губ. гарадах — галоўныя народныя вучылішчы. Школьная сістэма ў Расіі пач. 19 ст. — *прыходскія вучылішчы, павятовыя вучылішчы*, гімназіі. У 2-й пал. 19 ст. з'явіліся жан. гімназіі, *прагімназіі*, рэальныя вучылішчы, *земскія школы, царкоўна-прыходскія школы*.

На Беларусі Ш. ўзніклі адначасова з распаўсюджваннем хрысціянства і кірыліцы. Напачатку дзейнічалі толькі ў буйных гарадах (Полацк, Тураў) пры княжацкіх дварах і манастырах. У сувязі з пранікненнем на Беларусь ідэй Адраджэння з 16 ст. колькасць Ш. павялічвалася за кошт пратэстанцкіх навуч. устаноў, а таксама дзякуючы з'яўленню *брацкіх школ*. З канца 16 ст. ў час контррэфармацыі на Беларусь запрашаліся манаскія ордэны *езуітаў*, пазней *піяраў*, якія заснавалі тут уласныя публічныя навуч. ўстановы з высокім еўрап. узроўнем адукацыі (гл. *Віленскі універсітэт, Езуіцкія навучальныя ўстановы, Калегіум*). У 1773 у Рэчы Паспалітай створана *Адукацыйная камісія*, якая пачала працэс секулярызацыі айч. сістэмы асветы праз стварэнне акр., падакруговых і парафіяльных вучылішчаў. Адначасова ва Усх. Беларусі пачалі адкрывацца *народныя вучылішчы*. У 1803—1917 айч. Ш. ўваходзілі ў склад *Віленскай навучальнай акругі* і *Беларускай навучальнай акругі*. Палітыка царызму прывяла да ліквідацыі манаскіх Ш. (гл. *Полацкая езуіцкая акадэмія*) і уніфікацыі мясц. сістэмы адукацыі з агульнаімперскай. Да асн. тыпаў тагачасных Ш. адносіліся *настаўніцкая семінарыі*, гімназіі, прагімназіі, рэальныя вучылішчы, пав. вучылішчы, царк.-прыходскія Ш. Асобна развівалася жан. асвета, ствараліся жан. пансіёны. З 1860-х г. у Рас. імперыі праводзілася адукац. рэформа з мэтай надаць Ш. ўсесаслоўны характар. Моцныя рэв. і нац.-вызв. настроі сярод бел. моладзі прывялі да ліквідацыі ўладамі мясц. цэнтраў вышэйшай асветы, у т.л. *Горы-Горацкага земляробчага інстытута*. Асобна развіваліся ваен. (*Брэсцкі кадэцкі корпус, Нясвіжскі кадэцкі корпус, Полацкі кадэцкі корпус* і інш.) і духоўныя Ш. (гл. *Семінарыя*). Для дарослых ствараліся *нядзельныя школы*. У 1914—15 на Беларусі пераважалі пач. Ш. (з агульнай колькасці 7,7 тыс. Ш. пачатковых было 7,5 тыс.). Акрамя іх дзейнічалі 119 няпоўных сярэдніх і 71 сярэдняя навуч. ўстанова. З пачаткам 1-й сусв. вайны колькасць Ш. у Гродзенскай губ. скарацілася на 63%, Мінскай — на 40%, Магілёўскай — на 28%, Віцебскай — на 22%. Будынкі адукац. устаноў займалі вайск. часці, іх маёмасць і інвентар разрабаваны. У 1915 у Расію эвакуіравана больш за 200 навуч. устаноў (пераважна гімназіі, прагімназіі, рэальныя вучылішчы, настаўніцкія семінарыі і ін-ты), значная частка якіх пасля заканчэння ваен. дзеянняў не была рээвакуіравана на радзіму. У студз. 1915 міністр нар. асветы Рас. імперыі П.М.Ігнацьеў пачаў рэформу адукацыі, гал. ідэя якой была ў дэбюракратызацыі сістэмы адукацыі, у далучэнні да рэфармавання Ш. грамадскасці, земскіх устаноў і органаў гар. самакіравання. У канцы 1916 гэтая рэформа згорнута. На тэр. Беларусі былі адкрыты некалькі недзярж. гімназій, 3 жан. настаўніцкія семінарыі, пры настаўніцкіх ін-тах створаны 1-гадовыя пед. курсы, дзе большасць навучэнцаў складалі жанчыны.

Пасля Люг. рэвалюцыі 1917 у Расіі ў заканад. парадку ў сферы адукацыі зняты нац., паліт. і рэліг. абмежаванні. Створаны Дзярж. к-т, у кампетэнцыю якога ўваходзіла рэфармаванне школьнай адукацыі. Адроджана аўтаномія ун-таў, павышаны статус настаўніцкіх семінарый і ін-таў, пач. і сярэднія навуч. ўстановы меркавалася перадаць у падначаленне земскіх устаноў, дазвалялася ствараць навуч. ўстановы з выкладаннем на роднай мове. У зах. частцы Беларусі, што апынулася пад герм. акупацыяй, фарміравалася адукац. сістэма, якая падпарадкоўвалася загадам ням. галоўнакамандуючага Усх. фронтам і Упраўленню па ўсх. тэрыторыях. Паводле іх абвяшчаўся прынцып «народнасці»: у Ш. навучаліся дзеці ўсіх нацыянальнасцей і канфесій, мовай выкладання абвяшчалася родная мова, вял. ўвага аддавалася вывучэнню ням. мовы (рус. мова выкладалася факультатыўна).

Дзейнасць Ш. падлягала жорсткаму кантролю ням. акупац. адміністрацыі, сярэднія навуч. ўстановы і прафес.-тэхн. Ш. ў асноўным утрымліваліся на сродкі грамадскіх арг-цый. У перыяд герм. акупацыі 1915—18 набыла развіццё нац. Ш. асн. нац. груп. У час польска-сав. вайны 1919—20 ва ўмовах польскай акупацыі часткі Беларусі ў сферы адукац. палітыкі адбылося аднаўленне ранейшых форм навуч. устаноў (элементарная Ш. — вышэйшая элементарная Ш., або прагімназія — гімназія). Цэласная праграма па арганізацыі школьнай справы адсутнічала, гвалтоўна насаджалася польская адукацыя, закрываліся бел. і рус. Ш. Тым не менш, дзякуючы дзейнасці Мінскай бел. школьнай рады, Бел. цэнтр. школьнай рады, Часовага бел. нац. к-та і інш. арг-цый на акупіраванай частцы Беларусі дзейнічала больш за 200 бел. пач. Ш., 5 бел. гімназій, 3 бел. настаўніцкія курсы, Мінскі бел. пед. ін-т, выдадзена некалькі тыс. экз. бел. навуч. л-ры, распрацаваны праграмы для нац. пач. Ш. У час існавання *Сярэдняй Літвы* ў межах Віленшчыны створана каля 200 бел. пач. Ш.

Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 сав. школьная сістэма адукацыі складвалася ва ўсх. раёнах Беларусі, якія з вясны 1918 уключаны ў склад РСФСР. Першыя дэкрэты сав. улады па пытаннях адукацыі былі накіраваны на ліквідацыю старой школьнай сістэмы і распрацоўку асн. прынцыпаў сав. Ш. Гэтыя мерапрыемствы двойчы перапыняліся ў выніку пашырэння герм. і польскай акупацый 1918—20. У аснову пабудовы сав. Ш. былі пакладзены «Палажэнне аб адзінай працоўнай школе» і пастановы 1-й Парт. нарады (1921), паводле якіх дэкларавалася: сувязь Ш. з палітыкай Камуніст. партыі, бясплатная абавязковая агульная і політэхн. адукацыя, адзіная для ўсіх грамадзян свецкая Ш., дэмакр. арганізацыя навучання, якое павінна было мець прац. характар. Навучанне павінна было складаць 9 гадоў, Ш. падзялялася на 2 канцэнтры: 1-ы з 5-гадовым курсам навучання для дзяцей 8—13 гадоў і 2-і з 4-гадовым для дзяцей 13—17 гадоў. З 1922 асн. Ш. БССР абвяшчалася 7-гадовая, аднак масавай у 1920-я г. была пач. 4-гадовая Ш. У адпаведнасці з задачай політэхнізацыі 7-гадовая Ш. набыла вытв. ўхіл. На вёсцы ствараліся *школы сялянскай моладзі*, у горадзе — *фабрычна-заводская сямігодка*. Да сярэдзіны 1920-х г. сярэдняя Ш. на Беларусі адсутнічала, праграму *сярэдняй адукацыі* выконвалі *рабочыя факультэты*, агульнаадук. курсы, з 1926 — Ш. 9-гадовыя і 2-й ступені (8—9-я кл.). Апошнія класы ў большасці Ш. 2-й ступені і дзевяцігодак мелі прафес. характар. З 1930 Ш. 2-й ступені рэарганізоўваліся ў *тэхнікумы*, у сістэму нар. асветы ўведзена Ш.-дзесяцігодка з вытв. ухілам. У 1930-я г. пачалася уніфікацыя Ш. ў межах СССР. Пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб структуры пачатковай і сярэдняй школы ў СССР» ад 15.5.1934 усталёўвалася адзіная сістэма агульнаадук. Ш.: пач. (1—4-ы класы), няпоўная сярэдняя (1—7-ы класы), сярэдняя (1—10-ы класы).

У 1920-я г. ў БССР праводзілася палітыка *беларусізацыі*, выкладанне ў Ш. вялося на роднай мове, у праграмы ўводзіліся прадметы краязнаўчага цыкла, бел. мова была абавязковым прадметам выкладання ва ўсіх нац. Ш., яе веданне патрабавалася пры паступленні ў тэхнікумы і ВНУ. Пастановай СНК і Прэзідыума ЦВК БССР ад 7.4.1926 у БССР пачало ўводзіцца ўсеагульнае пач. навучанне, з 1932/33 навуч. г. — няпоўнае сярэдняе (гл. *Усеагульнае абавязковае навучанне*). Адначасова з сістэмы адукацыі знікалі Ш. нац. меншасцей, да канца 1930-х г. у БССР не засталося нац. Ш.

У 1920-я г. побач з агульнаадук. існавала прафес.-тэхн. Ш., якая базіравалася на пач. або няпоўнай сярэдняй адукацыі і побач з агульнай адукацыяй давала прафес. веды. Яе асн. тыпы: *фабрычна-заводскага вучнёўства школы*, прафшкола, прафклас, с.-г. Ш., вучэбна-практычныя майстэрні, Ш. с.-г. вучнёўства (сельгасвучы), Ш. саўгаснага і трактарнага вучнёўства. У 1940 пачалася перабудова прафес.-тэхн. адукацыі, стваралася сістэма прац. рэзерваў, якая ўключала *рамесныя вучылішчы*, чыг. вучылішчы і *фабрычна-заводскага навучання школы*. У 1920—30-я г. ў БССР разгорнута сетка Ш. і пунктаў па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці сярод дарослых; працавалі вячэрнія *школы для дарослых*.

У Зах. Беларусі ў 1927/28 навуч. г. працавала 3455 агульных Ш. і 85 гімназій. У 1932 у Польшчы пачалася рэформа адукацыі, якая ставіла за мэту ўсеагульнае навучанне. Уводзілася 3-ступеньчатая школьная структура, якая абмяжоўвала доступ да сярэдняй і вышэйшай адукацыі беларускаму, пераважна сял. насельніцтву. Бел. грамадскасць вяла барацьбу за нац. бел. Ш. У 1927—28 урад вымушаны быў адкрыць 29 бел. і 49 змешаных польска-бел. Ш., працавалі 4 бел. гімназіі. Аднак да 1938/39 навуч. г. ў Зах. Беларусі бел. Ш. фактычна не засталося. З уз'яднаннем Зах. Беларусі ў 1939 пачалося ўвядзенне сав. школьнай сістэмы, усеагульнага бясплатнага навучання ў аб'ёме сямігодкі, ствараліся нац. Ш.

У Вял. Айч. вайну ням. акупац. ўлады для ўсіх дзяцей, акрамя яўрэйскіх, уводзілі абавязковае школьнае навучанне (Часовая інструкцыя ад 10.9.1941). За адмову пасылаць дзяцей у Ш. на бацькоў і вучняў накладваліся розныя спагнанні. Мэтамі Ш. з'яўляліся выхаванне моладзі ў духу герм. нацыянал-сацыялізму і анямечванне. Паводле афіц. звестак акупантаў, у 1941/42 навуч. г. на тэр. Ген. акругі Беларусь працавала каля 3 тыс. Ш., у 1942/43 — 5 прагімназій, 16 прафес. Ш., 6 настаўніцкіх семінарый, некалькі мед., гандл. і маст. Ш. У процівагу фашысцкім Ш. узнікла «тайнае навучанне», у партыз. зонах дзейнічалі «ляснyя школы». Нямецкія фашысты спалілі і разбурылі каля 7 тыс. Ш., вывезлі або знішчылі вял. колькасць настаўнікаў. На неакупіраванай тэр. СССР у гады вайны ўзніклі новыя тыпы сярэдніх Ш.: суворaўскія і нахімаўскія вучылішчы, Ш. рабочай моладзі і Ш. сельскай моладзі. У 1950-я г. даваен. сетка Ш. адноўлена. Да сярэдзіны 1950-х г. у асн. завершана ўвядзенне ўсеаг. навучання за курс 7-гадовай Ш., пашырылася сярэдняя адукацыя. У 1958 7-гадовыя Ш. пераўтвораны ў 8-гадовыя, сярэднія — у агульнаадук. 11-гадовыя з вытв. навучаннем. З 1964 11-гадовыя Ш. зноў пераводзіліся на 10-гадовыя, з 1966 прафес. падрыхтоўка стала неабавязковай. З 1970/71 навуч. г. пач. Ш. перайшла на 3-гадовы тэрмін навучання. У 1970-я г. пачаўся пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. З сярэдзіны 1980-х г. у СССР пачалася чарговая рэформа агульнаадук. і прафес. Ш. У адпаведнасці з ёю ўведзена наступная структура адукацыі: пач. Ш. — 1—4-ы класы, няпоўная сярэдняя Ш. — 5—9-ы класы, сярэдняя агульнаадук. і прафес. Ш. — 10—11-ы класы, прафес. вучылішчы, *сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы*. Навучанне пачыналася з 6-гадовага ўзросту. Рэформа прадугледжвала больш цесныя ўзаемасувязі навучання і вытв. дзейнасці. У Ш. ўводзіўся курс асноў інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі; ствараліся спецыялізаваныя сярэднія навуч. ўстановы — гімназіі, ліцэі і каледжы. Да канца 1990-х г. на Беларусі фактычна працавала сав. Ш. У 2-й пал. 1990-х г. пачалася рэформа Ш., якая павінна ліквідаваць недахопы папярэдняй Ш. і перабудаваць працу ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу. Структура Ш. мяняецца: 1-я ступень — пач. Ш. (1—4-ы класы), 2-я ступень — асн. Ш. (5—10-ы класы); выпускнікі 10-х класаў будуць мець 3 варыянты працягу адукацыі: 3-я ступень адукацыі ў Ш. (11—12-ы класы), прафес.-тэхн. вучылішчы, тэхнікумы. Уводзіцца шырокая дыферэнцыяцыя навучання (агульны, гуманіт., прыродазнаўчы, эстэт., політэхн. тыпы ліцэяў). Юрыдычна атэстат пра заканчэнне 3-й ступені адукацыі любога профілю дае права на паступленне ў ВНУ.

У 2001/02 навуч. г. агульнаадук. сетка складалася з 4718 Ш. (1488,9 тыс. вучняў), з іх 1326 Ш. з 1087,5 тыс. вучняў у гарадах, 3305 з 378,3 тыс. вучняў у сельскай мясцовасці. Сярод іх 12 прыватных агульнаадук. Ш. з 1025 вучнямі. З агульнай колькасці Ш. 632 (19 тыс. вучняў) пачатковыя, 996 (67,4 тыс. вучняў) базавых (9-гадовых), 2774 (1264,1 тыс. вучняў) сярэднія, 100 гімназій (81,8 тыс. вучняў), 25 ліцэяў (11,2 тыс. вучняў), 6 каледжаў (2 тыс. вучняў), 98 спец. Ш. для дзяцей з асаблівасцямі псіхафіз. развіцця (20,2 тыс. вучняў), 87 вячэрніх (пазменных) Ш. (23,2 тыс. вучняў); ва ўсіх тыпах Ш. працавала 152,1 тыс. настаўнікаў. Дзейнічалі: 248 прафес.-тэхн. навуч. устаноў (138,6 тыс. навучэнцаў); 156 сярэдніх спец. навуч. устаноў (155,4 тыс. навучэнцаў), у т.л. 8 прыватных (6767 навучэнцаў); 58 ВНУ (301,8 тыс. студэнтаў), у т.л. 14 прыватных (41,8 тыс. студэнтаў). Гл. таксама раздзел Асвета ў арт. *Беларусь*.

Літ.: Сборник материалов для истории просвещения в России. Т. 1—4. СПб., 1823—1902; Погодин А. Виленский учебный округ 1803—1831 гг. СПб., 1901; Пастухова З.А. Среднее образование в дореволюционной Белоруссии. Мн., 1963; Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. Мн., 1968; Красовский Н.И. Высшая школа Советской Белоруссии. 2 изд. Мн., 1972; Новик Е.К. Формирование кадров народного образования Белоруссии (1917—1941 гг.). Мн., 1981; Дрозд Л.Н. Развитие средней общеобразовательной школы в Белоруссии, 1917—1941. Мн., 1986; Бабкоў А. Эвакуацыя і дзейнасць навучальных устаноў Беларусі ў Расіі ў гады першай сусветнай вайны (1915 — пачатак 1917 г.) // Культура беларускага замежжа. Мн., 1998. Кн. 3; Беларускае Асветніцтва: вопыт тысячагоддзя: Матэрыялы міжнар. кангр. Кн. 1. Мн., 1998; Ляхоўскі У. Беларуская справа падчас польскай акупацыі 1919—1920 гг. // Спадчына. 1994. № 6; Раманава І.М. Фарміраванне сістэмы адукацыі БССР у 20-я гг. // Весці АН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 1997. № 2; Снапкоўская С.В. Гісторыя адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі (60-я гг. XIX — пачатак XX ст.). Мн., 2001.

У.В.Ляхоўскі, І.М.Раманава, А.Ф.Самусік.

ШКО́ЛА ў выяўленчым, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве і архітэктуры, мастацкі кірунак, плынь, звязаныя агульнасцю ці блізкасцю светапогляду, ідэалаў, духоўных памкненняў, творчага метаду пэўнага кола творцаў; таксама творы, выкананыя вучнямі і паслядоўнікамі значнага майстра.

Характарызуе мастацтва і архітэктуру цэлай краіны (т.зв. галандскае, 17 ст., фламандскае, 17—18 ст., мастацтва), рэгіёна (горада, вобласці і інш.), калі яе своеасаблівасць выяўлена ў пэўных стылявых і храналагічных межах (*Наўгародская школа іканапісу, Наўгародская школа дойлідства, Балонская школа жывапісу, Фларэнційская школа жывапісу*). У навуч. установах пад кіраўніцтвам вядомага майстра часам ствараюцца групы ці майстэрні, якія выпрацоўваюць найб. устойлівыя арх.-маст. прынцыпы і манеры, што вызначаюць Ш. гэтай установы, адыгрываюць значную ролю ў развіцці сусв. культуры (вышэйшая Ш. буд-ва і маст. канструявання *«Баўгауз»* у Германіі, *Вышэйшыя мастацка-тэхнічныя майстэрні* і арх. ін-т у Маскве).

На Беларусі склаліся арыгінальныя Ш. па стварэнні твораў выяўл. і дэкар.-прыкладнога мастацтва: *Беларуская іканапісная школа, Куцеінская школа гравюры, Магілёўская школа гравюры, Беларуская рэзь, Івянецкая кераміка, Нёманскае шкло, Веткаўская разьба, Бабінавіцкая кераміка, Урэцка-налібоцкае шкло, Неглюбскія ручнікі, Мотальскія ручнікі* і інш.; сярод арх. Ш. — *Полацкая школа дойлідства, Гродзенская школа дойлідства, Магілёўская школа дойлідства, Віцебская школа дойлідства, Палескія школы дойлідства.*

В.Ф.Марозаў, Л.Дз.Налівайка.

ШКО́ЛА ПРА́ПАРШЧЫКАЎ, навучальнае падраздзяленне Узбр. Сіл Рэспублікі Беларусь для падрыхтоўкі *прапаршчыкаў*. Засн. ў 2001. Уваходзіць у склад Аб'яднанага навуч. цэнтра падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў (г. Барысаў). Курсанты набываюць спецыяльнасці: камандзіры мотастралковых узводаў (спецыялісты агульнавайск. палігонаў), камандзіры танкаў; спецыялісты наземнай артылерыі, па рамонце і захаванні бранятанк. і аўтамаб. тэхнікі, узбраення і боепрыпасаў, па сувязі; старшыны рот (батарэй); спецыялісты тылу, начальнікі складоў (харчовых, рэчавых, гаруча-змазачных матэрыялаў), камандзіры ўзводаў матэрыяльнага забеспячэння, начальнікі сталовых. Тэрмін навучання 5,5 мес. Набор — 2 разы ў год у добраахвотным парадку, без экзаменаў, з ваеннаслужачых кантрактнай службы ва ўзросце да 35 гадоў і асоб з цывільнай моладзі (пасля прыёму іх на службу па кантракце). Залічаныя ў школу атрымліваюць усе віды забеспячэння і размяшчаюцца ў казармах. Пасля заканчэння школы ім прысвойваецца воінскае званне «прапаршчык».

ШКО́ЛА-ІНТЭРНА́Т, агульнаадукацыйная ўстанова для пастаяннага знаходжання навучэнцаў, якія не маюць неабходных умоў для выхавання ў сям'і, а таксама для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Пачалі стварацца ў 1956. Асн. тыпы Ш.-і.: агульныя — для дзяцей з сем'яў, якія не маюць магчымасцей забяспечыць дзецям нармальнае выхаванне, у т.л. з няпоўных і мнагадзетных сем'яў, сем'яў, дзе бацькі маюць цяжкія захворванні, і інш.; санаторныя, у т.л. санаторна-лясныя школы — для дзяцей з рознымі захворваннямі, у т.л. для дзяцей, якія пацярпелі ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС; спецыяльныя — для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця; спецыялізаваныя — з паглыбленым вывучэннем асобных прадметаў для адораных дзяцей. У асобных выпадках дзеці жывуць у сем'ях або праводзяць выхадныя дні і канікулы ў сям'і. Дзеці накіроўваюцца ў Ш.-і. па путёўках аддзелаў адукацыі. Частка дзяцей утрымліваецца бясплатна, астатнія плацяць у залежнасці ад даходаў сям'і. Адукацыйныя праграмы і навуч. планы ў Ш.-і. адпавядаюць звычайным школам, а формы выхавання — дзіцячым дамам. У сельскай мясцовасці існуюць прышкольныя інтэрнаты для дзяцей, якія жывуць далёка ад школы. У 2001/02 навуч. г. на Беларусі працавалі 55 Ш.-і. агульнага тыпу (10 538 дзяцей), у т.л. 24 Ш.-і. для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў (5102 дзіцяці); 79 Ш.-і. для дзяцей з асаблівасцямі псіхафіз. развіцця (12 143 дзіцяці), у т.л. 12 Ш.-і. для дзяцей-сірот (1974 дзіцяці).

ШКО́ЛА-КАМУ́НА, 1) навучальна-выхаваўчая ўстанова інтэрнатнага тыпу ў 1918—30-я г. Ствараліся на аснове «Палажэння аб адзінай працоўнай школе РСФСР» (1918) з мэтай практычнай распрацоўкі новай педагогікі. Большасць з іх уваходзіла ў сістэму даследна-паказальных устаноў Наркамасветы РСФСР і рэспублік. Размяшчаліся пераважна ў сельскай мясцовасці. Складаліся з агульнаадук. школы, інтэрната, нярэдка ў іх уваходзілі дзіцячыя сады і прафес. навуч. ўстановы. Мелі навуч.-вытв. майстэрні, зямельныя ўчасткі. Навучэнцы ўдзельнічалі ў с.-г. работах, было развіта самаабслугоўванне. У 1923 мелася 178 Ш.-к. Найб. вядомыя Ш.-к.: Наркамасветы РСФСР імя П.М.Лепяшынскага ў Маскве, імя Кастр. рэвалюцыі ў Адэсе, Знаменская ў Вяцкай губ. На Беларусі працавалі *Ліцвінавіцкая школа-камуна* і *Леменская школа-камуна*. 2) Працоўная Ш.-к. АДПУ пры СНК СССР. Арганізаваны ў 1920-я г. па ініцыятыве Ф.Э.Дзяржынскага з мэтай перавыхавання і выхавання ў прац. калектыве беспрытульных дзяцей і непаўналетніх правапарушальнікаў. Камплектавалі такія Ш.-к. органы нар. адукацыі і міліцыі. Пры іх дзейнічалі розныя рамесныя майстэрні, вытв. цэхі, а ў 1930-я г. нават з-ды і ф-кі. З сярэдзіны 1920-х г. Ш.-к. побач з прафес. падрыхтоўкай давала агульнаадук. веды ў аб'ёме няпоўнай сярэдняй або сярэдняй школы. Найб. вядомыя Ш.-к.: Болшаўская прац. камуна (з 1924) пад Масквой (арганізавана М.С.Пагрэбінскім па даручэнні Дзяржынскага), Камуна імя Дзяржынскага пад Харкавам (1927, кіраўнік А.С.*Макаранка*).

ШКО́ЛЫ ДЛЯ ДАРО́СЛЫХ, агульнаадукацыйныя навуч. ўстановы для дарослых. На тэр. Рас. імперыі ўзніклі ў 1860-я г. і найчасцей давалі агульную адукацыю ў аб'ёме пачатковай школы ці паўтаралі яе курс з некат. дапаўненнямі (гл. *Вячэрняе навучанне, Нядзельныя школы*). Найб. пашырэнне набылі ў СССР у час ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці (на падставе дэкрэта СНК «Аб ліквідацыі непісьменнасці сярод насельніцтва РСФСР» ад 26.12.1919).

У БССР сетка школ і пунктаў па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці сярод дарослых разгорнута ў 1920-я г. (у 1928/29 навуч. г. 309 ліквідацыйных пунктаў і 319 школ малапісьменных), ствараліся і агульнаадук. Ш. для д. Рэформай 1922 устаноўлены 2 тыпы Ш. для д.: школы для малапісьменных з 6-месячным курсам навучання на базе ліквідацыйных пунктаў і вячэрнія Ш. для д. павышанага тыпу (ВШПТ) з 2—3-гадовым тэрмінам навучання. З 1923 ствараліся школы рабочай моладзі (ВШРМ) з 3-гадовым курсам. У 1926/27 навуч. г. ў БССР працавала 27 ВШПТ (6090 вучняў) і 89 ВШРМ (6100 вучняў). ВШПТ давалі веды за сямігодку, ВШРМ — за 5 класаў сямігодкі. У 1925/26 навуч. г. школы для малапісьменных у вёсках і с.-г. гурткі пераўтвораны ў вячэрнія школы калгаснай моладзі (у 1930 іх было 750, гл. *Школы сялянскай моладзі*). У пач. 1930-х г. ВШПТ і ВШРМ аб'ядноўваліся ў агульную школу з вытв. ухілам, якая мела 2 канцэнтры: 1-ы за 3 гады даваў веды ў межах сямігодкі і будаваўся на базе чатырохгодкі; 2-і на базе сямігодкі за 2

гады даваў сярэднюю адукацыю. У 1930/31 навуч. г. працавала 138 школ такога тыпу (15 200 вучняў), з іх 36 яўр. і 19 польскіх. У 1932 зацверджана новая сістэма навучання дарослых. Ствараліся політэхн. вытв. школы павышанага тыпу з тэрмінам навучання 2—2,5 года, якія давалі агульную адукацыю і рыхтавалі кадры рабочых сярэдняй кваліфікацыі і ніжэйшага тэхн. персаналу. У 1937 створаны завочныя няпоўныя сярэднія і сярэднія Ш. для д., у якіх навучэнцы, працуючы самастойна, атрымлівалі дапамогу праз арганізаваныя на месцах кансультацыйныя пункты. У 1920—30-я г. працавалі таксама *рабочыя факультэты* для падрыхтоўкі рабочых і сялян да паступлення ў ВНУ, з 1969 — падрыхтоўчыя аддзяленні.

У Вял. Айч. вайну ў 1943—44 на неакупіраваных тэр. СССР узніклі новыя тыпы Ш. для д.: школы рабочай моладзі і школы сельскай моладзі, якія з'яўляліся няпоўнымі сярэднімі ці сярэднімі агульнаадук. ўстановамі для навучання моладзі без адрыву ад прамысл. і с.-г. вытв-сці і будаваліся ў асн. паводле навуч. планаў і праграм агульнаадук. школ. У 1970-я г. вячэрнія (пазменныя) школы перайшлі на новыя планы і праграмы; працавалі школы з дзённай, завочнай і сесійнай формамі навучання. У 1980/81 навуч. г. на Беларусі працавала 214 школ (35 дзённых, 179 завочных), у якіх навучалася 81 560 чал.; 64 самаст. завочныя школы і 1 завочнае аддзяленне, 60 раённых завочных школ у сельскай мясцовасці з агульным кантынгентам навучэнцаў каля 29 тыс. чал. У 2001/02 навуч. г. працавала 87 вячэрніх (пазменных) школ (23,2 тыс. вучняў).

Літ.: Раманава І.М. Вячэрнія рабочыя школы ў сістэме дадатковай адукацыі БССР у 20-я гг. // Весці Нац. АН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 1999. № 1. *І.М.Раманава.*

ШКО́ЛЫ СЯЛЯ́НСКАЙ МО́ЛАДЗІ (ШСМ), пачатковыя і няпоўныя сярэднія школы ў СССР для навучання вясковай моладзі без адрыву ад с.-г. работ. Іх мэты — агульнаадук. падрыхтоўка і ўвязванне навучання з практыкай сельскай гаспадаркі шляхам непасрэднага ўдзелу вучняў у вытв. працы. На Беларусі пачалі стварацца ў 1924/25 навуч. г. (у 1924/25 іх было 10, у 1927/28 — 17, 1928/29 — 28, 1929/30 — 56, 1930/31 — 112). Планавалася праводзіць набор на базе 4 груп і даваць веды за курс 7-гадовай школы, аднак прымалі ў ШСМ з фактычным узроўнем ведаў паступаючых. У 1925/26 навуч. г. школы для малапісьменных і с.-г. гурткі пачалі пераўтварацца ў вячэрнія школы калгаснай моладзі. З 1929 школы такога тыпу ствараліся пры дзённых ШСМ, або прымацоўваліся да іх. Хуткі рост іх сеткі пачаўся з пераходам да масавай калектывізацыі, у 1930 іх было 750. З 1930 наз. школамі калгаснай моладзі (ШКМ), кожная школа павінна была мець спец. кірунак (паляводчы, жывёлагадоўчы і г.д.), асн. іх задача — удзел у калектывізацыі раёна. Пачалася рэарганізацыя 2 канцэнтраў усіх 7- і 9-гадовых вясковых агульнаадук. школ у ШКМ. У 1-й пал. 1930-х г. было прызнана, што агульнаадук. школа з прафес. ухілам не забяспечвае неабходнага ўзроўню ведаў навучэнцам, ШКМ пераўтвораны ў 7-гадовыя школы.

Літ.: Раманава І.М. Фарміраванне сістэмы адукацыі БССР у 20-я гг. // Весці АН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 1997. № 2. *І.М.Раманава.*

ШКО́ЛЬНАЕ ВО́ЗЕРА. У Лепельскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дзіва, каля в. Камень, за 20 км на ПнУ ад г. Лепель. Пл. 0,22 км², даўж. 740 м, найб. шыр. 490 м, найб. глыб. 5,2 м, даўж. берагавой лініі 2,1 км. Пл. вадазбору 6,9 км². Катлавіна тэрмакарставага тыпу, авальная, выцягнутая з З на У. Схілы катлавіны выш. 3—5 м, на Пд месцамі да 15 м, разараныя. Берагі нізкія, пясчаныя, забалочаныя, месцамі сплавінныя. Пойма шыр. 10—15 м на Пн і Пд, 150—250 м на З і У, забалочаная і ўкрытая хмызняком. Дно да глыбіні 2—2,5 м пясчанае, ніжэй ілістае і сапрапелістае. Шыр. паласы прыбярэжнай расліннасці 2—60 м да глыб. 2 м. Упадаюць 6 ручаёў, выток у воз. Чаросава.

ШКО́ЛЬНАЯ ДРА́МА, жанр драматургіі, пашыраны ў канцы 16—18 ст. на Беларусі і Украіне, у канцы 17 — пач. 18 ст. ў Расіі. Паходжаннем звязана са статутамі навуч. устаноў, якія патрабавалі абавязковага сцэн. паказу з мэтай лепшага вывучэння лац. мовы, правіл паэтыкі і рыторыкі. Інсцэніроўкі Ш.д. ажыццяўляліся ў *школьных тэатрах* пры духоўных і свецкіх навуч. установах.

Напачатку мела характар *маралітэ* (п'есы на біблейскія, міфалагічныя ці гіст. сюжэты). У канцы 17 ст. з'явіліся п'есы на паліт. тэмы, што сведчыла пра непасрэдную зацікаўленасць развіццём Ш.д. з боку вышэйшых свецкіх улад, якія лічылі т-р сродкам узвелічэння свайго аўтарытэту («Свята міру» і інш.). Ш.д. мела пераважна клерыкальны характар. У эстэт. плане арыентавалася на сістэму маст. светаўспрымання *барока*. У яе сцэн. структуры — хары, пантамімы, пралог, антыпралог, інтэрмедыі, эпілог; п'еса складалася з 3—5 актаў, ролі размяркоўваліся паводле закону кантрасту, што сімвалізавала барацьбу сіл дабра і зла. Звычайна пісалася сілабічным вершам.

На Беларусі развівалася пад уплывам польскага езуіцкага т-ра. Пераважалі пастаноўкі на лац. мове, некат. п'есы ў Ш.д. разыгрываліся на польскай, стараслав., бел. мовах. Інтэрмедыі часцей ставілі на бел. мове, яны былі дэмакр. па змесце і стылі. У адрозненне ад дыдактычных і маралізатарскіх драм у іх падаваліся сцэнкі быт., парадыйна-анекдатычныя, сатырычныя. Першыя паказы Ш.д. належаць *Полацкаму школьнаму тэатру*. Вял. ролю ў папулярызацыі Ш.д. ў канцы 17 ст. адыграў *Сімяон Полацкі*. Вядомы Ш.д. ўкр. і бел. пісьменнікаў М.*Даўгалеўскага* і Г.*Каніскага*. У часы раняга Асветніцтва (1740—60-я г.) традыцыі Ш.д. развівалі т-ры, якія дзейнічалі ў Бабруйску, Брэсце, Гродне, Слоніме і інш. У 2-й пал. 18 ст. Ш.д. пісалі К.*Марашэўскі* і М.*Цяцерскі*. Ш.д. ў свой час адыграла значную ролю ў развіцці нац. мастацтва. У канцы 18 ст. школьны т-р страціў сваё значэнне. Функцыю паліт. прапаганды пачалі выконваць драматург. творы, якія ствараліся для прафес. т-ра.

Літ.: Бадалич Й.М., Кузьмина В.Д. Памятники русской школьной драмы XVIII в. М., 1968; Всеволодский-Гернгросс В.Н. Русский театр: От истоков до середины XVIII в. М., 1957; Гісторыя беларускага тэатра. Мн., 1983. Т. 1. С. 129—152, 169—176; Мальдзіс А. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мн., 1980. *А.А.Шалемава.*

ШКО́ЛЬНЫ ТЭА́ТР, тэатр пры духоўных навуч. установах (у акадэміях, калегіумах, брацкіх школах) сярэдневякоўя — 18 ст. Быў пашыраны на Беларусі, Украіне, у Расіі. Узнік у навуч. установах Зах. Еўропы ў сярэднія вякі як сродак выхавання, вывучэння лац. мовы, выпрацоўкі адпаведных эстэт. густаў і дабрачыннасцей. Яго вытокі звязаны, з аднаго боку, з нар. ігрышчамі, маскарадамі, пераапрананнямі, «пацехамі» скамарохаў, з фальклю. драмай, з другога — з імкненнем царквы надаць тэатралізаваны характар рэліг. абрадам, падаць іх у жывым дзеянні, інсцэніраваць найб. драм. эпізоды Бібліі. Ш.т. спалучаў у сабе містэрыяльныя традыцыі, вопыт ант. драматургаў (асабліва Плаўта і Тэрэнцыя) са здабыткамі свецкай драматургіі эпохі Адраджэння. У краінах Зах. Еўропы Ш.т. паспрыяў развіццю *літургічнай драмы, містэрыі*.

На Беларусь Ш.т. прыйшоў з Польшчы ў 16 ст. Яго ўзнікненне і развіццё звязана з дзейнасцю езуітаў, якія вял. месца адводзілі школьнай адукацыі. Езуіцкія Ш.т. існавалі ў многіх гарадах і мястэчках Беларусі (гл. *Полацкі школьны тэатр, Пінскі школьны тэатр, Гродзенскі школьны тэатр, Віцебскі школьны тэатр, Навагрудскі школьны тэатр, Мінскі школьны тэатр, Нясвіжскі школьны тэатр, Брэсцкі школьны тэатр, Аршанскі школьны тэатр*). У 1-й чвэрці 18 ст. Ш.т. ўзніклі таксама ў Слуцку (1715—36), Жодзішках Смаргонскага р-на (1716—30), Мсціславе (вядомы ў 1729), пазней існавалі *Слонімскі школьны тэатр, Бабруйскі школьны тэатр*. У рэчышчы Ш.т. была дзейнасць *Сімяона Полацкага* ў правасл. брацкай школе пры Богаяўленскім манастыры ў Полацку ў 1656—64, вучні якой выконвалі спецыяльна для іх напісаныя дэкламацыі Сімяона Полацкага, стваральніка Ш.т. ў Расіі. Наладжвалі паказы Ш.т. і пратэстанты (зафіксаваны ў 1686 у Слуцку). У 2-й пал. 18 ст. дзейнічалі Ш.т. піяраў у Віцебску (вядомы паказы ў 1765) і Лідзе (паказы ў 1771, 1772). З сярэдзіны 18 ст. Ш.т. арганізоўвалі уніяцкія і правасл. навуч. ўстановы. У адпаведнасці з мастацтвам барока, у рэ-

чышчы якога развіваўся Ш.т., спектакль уяўляў сабой пышнае відовішча з музыкай, песнямі, танцамі, паміж актамі выконваліся *інтэрмедыі*, хары, балеты. Пераважалі пастаноўкі на лац. мове. Сярод іх: драмы перадвеліконага тыдня (пасіі, апавяданні пра пакуты Хрыста і яго паслядоўнікаў), масленічныя драмы (выконваліся паміж Калядамі і Вял. постам, у іх асуджалася разгульнае грэшнае жыццё, злоўжыванне віном), драмы, прымеркаваныя да канца навуч. года, т. зв. канікулярныя, найб. свецкія па характары, найчасцей прысвячаліся мясц. магнатам-мецэнатам. Для сюжэтаў *школьных драм* выкарыстоўваліся розныя крыніцы: Свяшчэннае пісанне (Біблія), агіяграфія, ант. міфалогія, гісторыя айч., краін Усходу і Зах. Еўропы. У рэпертуары Ш.т. — трагедыі, камедыі, трагікамедыі, літургічныя драмы, тэатралізаваныя суды і дыспуты, дыялогі, арацыі, паказы-прамовы. З пашырэннем асветніцкіх ідэй у 18 ст. паказы ў большасці адбываліся на польскай мове. Паказальныя ў гэтым плане Ш.т. базыльянскія ў Жыровічах (ставіліся драмы на лац. і польскай мовах з бел. інтэрмедыямі, вядомы паказы ў 1752) і Навагрудку (1760-я г., у 1761 пастаўлена пераробка камедыі Мальера «Прытворна хворы»). Тыпова асветніцкім у 1787—91 быў *Забельскі школьны тэатр*, які вызначаўся разнастайным рэпертуарам: польскія трагедыі на сюжэты з ант. гісторыі, камедыі, у якіх побач з польскай ужывалася бел. мова (у т.л. «Камедыя» К.Марашэўскага, «Доктар па прымусе» М.Цяцерскага — пераробка аднайм. камедыі Мальера, «Пышнагольскі» І.Юрэвіча), аперэта «Апалон-заканадаўца, або Рэфармаваны Парнас», дыялогі, найб. асветніцкія па характары («Пчолы», «Пра ашчасліўленне чалавека» і інш.), у якіх дыскуціраваліся надзённыя грамадска-філас. праблемы. Адбывалася пераарыентацыя рэпертуару з асветніцкіх пазіцый: раней быў разлічаны пераважна на публіку са шляхты, у сярэдзіне 18 ст. ён больш наблізіўся да шырокага гледача. Школьныя драмы стваралі выкладчыкі паэтыкі і рыторыкі паводле існуючых канонаў (заснавальнікі паэтыкі Дж.Пантан і Скалігер; узорам лічыліся лац. драмы Н.Касена, Я.Бідэрмана, Н.Аванцына і інш.). Яны ж навучалі вучняў і акцёрскаму мастацтву. Ш.т. меў сваю распрацаваную паэтыку (трактаты М.К.Сарбеўскага, Г.Каніскага, Я.Масены, Пантана, Ф.Ланга) з кананізаванымі сродкамі сцэн. руху і манеры выканання, грыму, абсталявання і афармлення сцэны. Сярод аўтараў — Ю.Катэнбрынг, Ф.Навадворскі, Ф.Ідвель, Ян Віхерт; мастакі Ян Т.Клаўс, Г.Грубер.

Літ.: Карский Е.Ф. Белорусы. Т. 3, вып. 2. Пг., 1921; Конан У.М. Полацкі курс паэтыкі М.К.Сарбеўскага (1618—1627 гг.) // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1972. № 1; Мальдзіс А.І. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мн., 1980; Школьны тэатр // Гісторыя беларускага тэатра. Мн., 1983. Т. 1; Міско С.М. Школьны тэатр Беларусі XVI—XVIII стст. Мн., 2000.

Я.К.Усікаў.

ШКО́ЛЬНЫЯ ЛЯСНІ́ЦТВЫ, добраахвотныя прац. аб'яднанні школьнікаў, якія ствараюцца з мэтамі выхавання беражлівых адносін да прыроды, паглыблення і пашырэння ведаў па батаніцы і заалогіі, азнаямлення з асновамі лесаводства і метадамі аховы, догляду і аднаўлення лясоў. Задачы Ш.л.: дапамога лесагасп. прадпрыемствам, удзел у пасадцы і сяўбе лесу, збор лек. сыравіны, грыбоў, ягад, насення дрэвавых і кустовых пародаў і інш. Тэарэт. і практычныя заняткі ў Ш.л. вядуць спецыялісты лясной гаспадаркі. На Беларусі дзейнічаюць з 1961. У 2000 працавалі 262 Ш.л. (5840 членаў), за якімі замацавана 26 096 га лесанасаджэнняў.

А.А.Малажаўскі.

ШКРА́БА Рыгор Васілевіч (17.3.1919, в. Краснадворцы Салігорскага р-на Мінскай вобл. — 25.6.1997), бел. крытык, літаратуразнавец. Засл. работнік культ. Беларусі (1978). Скончыў БДУ (1946). Настаўнічаў. З 1946 працаваў у газ. «Літаратура і мастацтва», з 1957 у час. «Полымя». Друкаваўся з 1940. Даследаваў сучасную бел. л-ру (творчае майстэрства, маст. стыль, мову прозы бел. пісьменнікаў). У кнігах «Сіла слова» (1958), «Характар. Стыль. Дэталь» (1965), «Літаратура і мова» (1969) аналізаваў своеасаблівасць літ. і моўнага майстэрства, ролю маст. сродкаў у творах Я.Купалы, Я.Коласа, К.Чорнага, К.Крапівы, Я.Брыля, М.Танка і інш. Сааўтар тлумачальнага слоўніка прыказак і прымавак «Крынічнае слова» (1987, з І.Шкраба). Аўтар артыкулаў па праблемах маст. перакладу, выкладання л-ры ў школе, падручнікаў па бел. сав. л-ры.

Тв.: Скарбы. Мн., 1973; Энергія слова. Мн., 1988; Моваю вобразаў: Выбранае. Мн., 1989.

Літ.: Бугаёў Дз. Удумлівы даследчык // Бугаёў Дз. Чалавечнасць. Мн., 1985.

І.Д.Казека.

ШКРЭ́ТА, Шкрэта Шотнаўскі з Заваржыц (Škréta Šotnovský ze Závořic) Карал (1610, Прага — пахаваны 1.8.1674), чэшскі жывапісец; заснавальнік чэш. школы жывапісу барока. Вучыўся ў Празе ў Э.Садалера. З 1630 жыў у Італіі, дзе вывучаў работы майстроў *венецыянскай школы жывапісу* і *балонскай школы жывапісу*, творчасць М.*Караваджа*, Н.*Пусэна*, К.*Ларэна*. З 1638 працаваў у Чэхіі, пераважна ў Празе. Пісаў шматфігурныя алтарныя кампазіцыі, насычаныя дзеяннем і драм. эмоцыямі (цыкл карцін на тэмы жыцця св. Вацлава, 1641—43; «Узнясенне», 1644), партрэты, якія вылучаюцца глыбінёй раскрыцця яркіх і складаных характараў («Партрэт прыёра мальтыйскага ордэна Б. дэ Вітэ», 1650). Псіхал. напружанасць і прыўзнятасць вобразаў спалучаў з цікавасцю да быт. дэталей, простанар. тыпажоў: «Св. Карл Барамейскі наведвае хворага чумой» (1647).

ШКУ́ДКА, у беларусаў судна, прызначанае для захоўвання і перавозу жывой рыбы. Лакальная назва саж. Рабілі з дошак, накшталт лодкі, закрытай зверху. Для цыркуляцыі вады паміж дошкамі пакідалі шчыліны. Былі выдзеўбаныя Ш. Драўлянай калодзе надавалі належную форму, затым распілоўвалі яе ўздоўж папалам, выдзёўбвалі поласці, прасвідроўвалі ў сценках дзіркі, выразалі праём для дзверцаў і прыстаўлялі палавінкі адна да адной так, што пасудзіна набывала першапачатковую форму. Паміж сабой палавінкі змацоўваліся скобкамі. Ш. з рыбай прыбуксіроўвалі да лодкі. Ш. найб. характэрна для традыц. рыбалоўнага промыслу палешукоў.

І.М.Браім.

Шкудка.

ШКУ́НЦІЦА, другая назва р. *Паловіца* ў Глыбоцкім і Шаркаўшчынскім р-нах Віцебскай вобл.

ШКУРКО́ Валянцін Мікалаевіч (н. 22.7.1932, в. Буркі Брагінскага р-на Гомельскай вобл.), бел. філосаф і педагог. Канд. філас. н. (1966), праф. (1980). Засл. работнік вышэйшай школы Беларусі (1972). Скончыў БДУ (1955). Настаўнічаў, быў на камсамольскай і парт. рабоце. З 1968 рэктар Мазырскага пед. ін-та. З 1974 нач. упраўлення пед. навуч. устаноў Мін-ва адукацыі Беларусі. З 1978 прарэктар Бел. пед. ун-та. Навук. працы па праблемах фарміравання і выхавання асобы, сац. развіцця, навук.-тэхн. рэвалюцыі, тэорыі і методыкі выкладання філасофіі.

Тв.: Подъем культурно-технического уровня колхозного крестьянства. Мн., 1969; Проблемы формирования всесторонне развитой личности колхозников. Мн., 1971; Социальные последствия научно-технической революции в сельском хозяйстве капиталистических стран. Мн., 1973.

ШКУРКО́ Васіль Адамавіч (17.4.1919, в. Буркі Брагінскага р-на Гомельскай вобл. — 1998), бел. юрыст. Канд. юрыд. н. (1953), праф. (1979). Скончыў Ленінградскі ун-т (1950). У 1953—58 у Іркуцкім ун-це. З 1962 у БДУ (у 1965—72 дэкан ф-та). Навук. працы па праблемах крыміналогіі, крымін. заканадаўства, арганізацыі барацьбы са злачыннасцю.

Тв.: Уголовное право БССР. Т. 1. Часть общая. Мн., 1978; Наблюдательные комиссии. Мн., 1978; Совершенствование уголовно-правовых мер борьбы с преступностью. Мн., 1980 (разам з М.А.Яфімавым); Браконьерство и борьба с ним. Мн., 1986.

ШКУТ Мікалай Васілевіч (1.3.1937, в. Сялявічы Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. — 21.12.2002), бел. вучоны ў галіне інфарматыкі. Канд. фіз.-матэм. н. (1972), дацэнт (1990). Скончыў БДУ (1959). З 1959 у Ін-це матэматыкі Нац. АН Беларусі (заг. лабараторыі, нам. дырэктара). З 1998 у БДУ. Навук. працы па аўтаматызацыі праграмавання і праграмным забеспячэнні ЭВМ. Выканаў параўнальны аналіз моў праграмавання, распрацаваў серыю транслятараў з алгарытмічных моў тыпу АЛГОЛ для ЭВМ «Мінск» і інш. Прэмія Ленінскага камсамола 1970. Дзярж. прэмія Беларусі 1982.

Тв.: АЛГАМС ДОС ЕС ЭВМ. М., 1977 (у сааўт.); Трансляция АЛГОЛ-программ в параллельные программы (разам з А.М.Калеснікам) // Кибернетика. 1985. № 3. *М.П.Савік.*

ШЛАГБА́УМ (ням. Schlagbaum), рухомая перакладзіна для адкрывання і закрывання шляху на чыг. пераездах, заставах і дарогах. Бываюць з ручным або мех. прыводам і аўтаматычныя. Аўтам. Ш. працуюць па сігналах сістэм чыг. аўтаматыкі і тэлемеханікі, маюць святлафорную і гукавую сігналізацыі.

ШЛА́ЙХЕР, Шляйхер (Schleicher) Аўгуст (19.2.1821, г. Майнінген, Германія — 6.12.1868), нямецкі мовазнавец; заснавальнік т.зв. натуралістычнага кірунку ў лінгвістыцы, адзін з заснавальнікаў *параўнальна-гістарычнага мовазнаўства*. Чл.-кар. Пецярб. АН (1857). З 1850 праф. Пражскага, з 1857 Іенскага ун-таў. Пад уплывам вучэння Ч.Дарвіна разглядаў мову як жывы арганізм, які развіваецца паводле законаў прыроды. Тэарэтычна ўдакладніў паняцце моўнай сям'і і генеалагічнай роднасці, прапанаваў т.зв. тэорыю генеалагічнага дрэва. Распрацоўваў асновы *тыпалагічнай класіфікацыі моў*. Параўнальны метад вывучэння моў падрыхтаваў глебу для вучэння аб фанет. законах младаграматыкаў (гл. *Младаграматызм*). Адзін з першых вывучаў жывыя мовы, у т.л. літоўскую, і дыялекты; займаўся слав. мовамі. У «Кампедыуме параўнальнай граматыкі індагерманскіх моў» (ч. 1—2, 1861—62) выклаў сістэму індаеўрап. моў.

ШЛАК (ад ням. Schlacke) у металургіі, расплаўленае (пасля цвярдзення — камене- ці шклопадобнае) рэчыва, утворанае ў час металург. плавільных працэсаў з флюсаў, прадуктаў металург. рэакцый, попелу паліва і інш. Папярэдне падрыхтаваны (сінт. Ш.) выкарыстоўваюць пры плазменна-дугавым і *электрашлакавым пераплаве, рафінаванні* металаў і інш. Ш. паліўны — рэшткі паліва, утвораныя пры яго згаранні ў топках паравых катлоў; сплаўлены ў топцы попел каменнага вугалю. Ш. выкарыстоўваюць у вытв-сці буд. матэрыялаў (напр., аглапарыту, шлакаваты, шлакабетону), як угнаенне і інш.

ШЛАПУНО́Ў Васіль Мікалаевіч (н. 30.7.1932, в. Белая Дуброва Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне кормавытворчасці і раслінаводства. Д-р с.-г. н. (1988), праф. (1989). Акад. Нац. АН Беларусі (2003), Агр. АН Беларусі (1996), Укр. агр. АН (1999). Скончыў БСГА (1960). З 1962 у Бел. НДІ земляробства і селекцыі (у 1971—2001 нам. дырэктара). Навук. працы па тэхналогіі вырошчвання сіласных культур, аднагадовых траў і кармавых культур у прамежкавых пасевах; распрацоўка высокапрадукц. простых і складаных аграфітацэнозаў, якія забяспечваюць высокую прадукцыйнасць палёў; удасканаленне сістэм павелічэння выт-сці кармавога бялку, павышэння якасці кормоў, насенняводства кармавых культур.

В.М.Шлапуноў.

Тв.: Промежуточные культуры. Мн., 1979 (разам з Г.І.Шайгарэвічам, Р.А.Гольдман); Возделывание крестоцветных культур в Белоруссии. Мн., 1982; Полевое кормопроизводство. 2 изд. Мн., 1991.

ШЛЕГ Алесь (Аляксандр Карпавіч; 15.10.1936, в. Вялікі Бор Хойніцкага р-на Гомельскай вобл. — 6.7.1988), бел. пісьменнік. Скончыў БДУ (1965). Працаваў рабочым, у друку, на Бел. тэлебачанні і радыё. Друкаваўся з 1954. У зб. апавяданняў і нарысаў «Трывожная памяць» (1968), аповесцях «Цыганок» (1971), «Праўда адна» (1974), «Тайна Чорнага Бору» (апубл. 1991) і інш. маральна-этычная праблематыка, зварот да дакумент. матэрыялаў, гіст. падзей. Аўтар кінасцэнарыяў дакумент. фільмаў «Балтыйцы», «Палескі Марэсьеў», «Мой дом у бядзе», «Ядвіга Іосіфаўна», радыёспектакляў «Цыганок», «Рэха баравое» і інш. На бел. мову перакладаў творы рус., польскіх, укр. пісьменнікаў.

Тв.: Жыло чаканне болю: Апавяданне, аповесць. Мн., 1979; Хлеб на далонях тваіх. Мн., 1986 (разам з Т.І.Харавец).

ШЛЕГ Людміла Карпаўна (н. 21.9.1948, г. Баранавічы Брэсцкай вобл.), бел. кампазітар. Скончыла Бел. кансерваторыю (1972, кл. Дз.*Смольскага*), Маскоўскі нар.-маст. ун-т імя Крупскай (1980). Найб. дасягненні ў галіне вак.-сімф., хар. і арк. музыкі. Для твораў 1970—80-х г. характэрны неафалькл. тэндэнцыі, тэатралізацыя муз. форм, актыўнае ўжыванне элементаў сучасных кампазітарскіх тэхнік, яркасць нац. каларыту, для твораў 1990 — пач. 2000-х г. — духоўная тэматыка, маст.-абагульненыя літургічныя формы і жанры. Сярод твораў: опера-дзейства «Калядкі» (1975); для сімф. арк. сюіта «Кірмашовыя замалёўкі», паэма «Сымон-музыка» (абедзве 1980), канцэрт-феерыя для англ. ражка «Юр'еў дзень» (1989); камерна-інстр. і вак. творы, рэквіем «Памятайце» (1982), араторыя «Сказ пра Ігара» (1985), кантата «Трава-мурава» (1982); хар. творы, у т.л. канцэртны трыпціх «Sancta Mater» для дзіцячага хору, салістаў, аргана і арк. (1992), хар. сюіта «Лубок» (1976); 2 «Літургіі» (1999—2001) і 2 «Усяночныя дбанні» (2000—2002) для аднароднага хору, хар. фрэска паводле абраза А.Рублёва «Святая Тройца» (1993), хар. канцэрт «Святло Бацькаўшчыны» (2002), арк. фрэска «Велікодныя званы» (2000); камерна-інстр. і вак. творы; музыка для дзяцей, у т.л. радыёопера «Тараканішча» (1972), опера «Каваль — залатыя рукі» (1980) і інш. Піша абразы.

Літ.: Юденич Н.Н. Доброго пути! // Сов. музыка. 1983. № 8. *Р.М.Аладава.*

ШЛЕ́ГЕЛЬ (Schlegel) Аўгуст Вільгельм (8.9.1767, г. Гановер, Германія — 12.5.1845), нямецкі гісторык л-ры, пісьменнік, перакладчык. Брат Ф.*Шлегеля*. Ганаровы чл. Пецярб. АН (1824). Вучыўся ў Гётынгенскім ун-це (1787—91). У 1796—1804 выкладчык Іенскага і Берлінскага, з 1818 праф. Бонскага ун-таў. У 1798—1800 з братам выдаваў час. «Athenaeum» («Атэнеум»), вакол якога групаваліся прадстаўнікі школы *іенскіх рамантыкаў*. У берлінскіх «Лекцыях аб прыгожым пісьменстве і мастацтве» (1801—04, выд. 1884) і венскіх «Лекцыях аб драматычным мастацтве і літаратуры» (1809—11) сістэматызаваў літ.-эстэт. погляды іенцаў; вытокам рамант. мастацтва лічыў сярэдневяковую л-ру з яе духам рыцарства, паэтызацыяй кахання і набожнасцю; ант. л-ру прапагандаваў рамантычнай як пластычную, цялесную — вытанчанай і духоўнай. Аўтар зб. «Паэтычныя творы» (1811), драм «Трыстан» (1800, незавершана), «Іон» (1803) і інш. Перакладаў драмы П.Кальдэрона, санеты Ф.Петраркі; зрабіў (з Л.І.*Цікам*) першыя высокамаст. пераклады твораў У.Шэкспіра. Склаў анталогію паэзіі эпохі Адраджэння «Букеты кветак італьянскай, іспанскай і партугальскай паэзіі» (1804).

Тв.: Рус. пер. — у кн.: Литературные манифесты западноевропейских романтиков. М., 1980.

Літ.: Дмитриев А.С. Романтическая эстетика А.В.Шлегеля. М., 1974. *М.С.Яскевіч.*

ШЛЕ́ГЕЛЬ (Schlegel) Фрыдрых (10.3.1772, г. Гановер, Германія — 12.1.1829), нямецкі філосаф культуры, пісьменнік; тэарэтык школы *іенскіх рамантыкаў*. Брат А.В.*Шлегеля*. Вучыўся ў Гётынгенскім і Лейпцыгскім ун-тах. У 1798—1800 з братам выдаваў час. «Athenaeum» («Атэнеум»). Даследаваў значэнне ант. л-ры для тагачаснай паэзіі («Гісторыя грэчаскай і рымскай паэзіі», 1798). Асн.

прынцыпы новай рамант. паэзіі сфармуляваў у т.зв. лікейскіх (1797) і атэнейскіх (1798) фрагментах, у якіх дэкларуецца абс. свабода творчай індывідуальнасці ў выбары тэм і сродкаў іх раскрыцця, сцвярджаецца прынцып універсальнасці: спалучэння ў рамант. творы розных літ. жанраў, відаў мастацтва, дасягненняў гуманіт., прыродазнаўчых і грамадскіх навук, уводзіцца паняцце рамант. іроніі як сродку ўзвышэння над паўсядзённасцю і выказаць пратэст супраць дагматызму; яны адметныя выкарыстаннем афарыстычнай формы як сведчання прынцыповай незавершанасці, рухомасці рамант. думкі і права аўтара на адвольную кампазіцыю твора. У рамане «Люцында» (1799, незавершаны), тэарэт. працы «Размова пра паэзію» (1800) увасобіў у маст. форме ўсе тэарэт. палажэнні аб рамант. л-ры. Аўтар драмы «Аларкос» (1802), вершаў і інш.

Тв.: Рус. пер. — Люцинда // Избранная проза немецких романтиков. М., 1979; У кн.: Литературные манифесты западноевропейских романтиков. М., 1980.

Літ.: Берковский Н.Я. Романтизм в Германии. Л., 1973; Грешных В.И. Ранний немецкий романтизм: Фрагментар. стиль мышления. Л., 1991. *М.С.Яскевіч.*

ШЛЕ́ЕРМАХЕР (Schleiermacher) Фрыдрых (21.11.1768, г. Вроцлаў, Польшча — 12.2.1834), нямецкі філосаф і пратэстанцкі тэолаг. Атрымаў багаслоўскую адукацыю і шмат гадоў займаўся прапаведніцкай дзейнасцю. Праф. філасофіі і тэалогіі ва ун-тах Галле і Берліна. Быў блізкі да гуртка *іенскіх рамантыкаў*. У ранніх працах («Прамовы аб рэлігіі», 1799, і «Маналогі», 1800) у духу пач. рамантызму стварыў цэласны вобраз рэліг.-эстэт. светапогляду, які грунтуецца на асабістым унутр. перажыванні і выступае як «сузіранне універсуму» і «пачуцця залежнасці» ад бясконцага. Зыходзячы з гэтых пазіцый, лічыў, што рэліг. жыццё — жывое зліццё з Богам; прырода рэліг. пачуцця не мае патрэб ні ў догматах, ні ў ацэнцы з дапамогай рацыянальных крытэрыяў. Псіхалагізм і крытычныя адносіны да рацыяналістычнай традыцыі ў Ш. выявіліся і ў філасофіі, у прыватнасці, у распрацоўцы ім праблем герменеўтыкі, якую ён разглядаў як майстэрства разумення чужой індывідуальнасці («іншага») на аснове агульнасці мовы і мыслення. Аўтар прац: «Дыялектыка» (выд. 1839), «Эстэтыка» (выд. 1842), «Вучэнне аб дзяржаве» (выд. 1845), «Філасофія этыкі» (выд. 1870) і інш. Ш. належыць класічны пераклад Платона на ням. мову.

А.Б.Савеня.

ШЛЕ́ЗВІГ-ГО́ЛЬШТЭЙН (Schleswig-Holstein), зямля на Пн Германіі, паміж Паўночным і Балтыйскім морамі. Мяжуе на Пн з Даніяй. Пл. 15,7 тыс. км². Нас. 2,7 млн. чал. (1994). Адм. ц. — г. *Кіль*, значныя гарады: Любек, Фленсбург, Ноймюнстэр, Рэндсбург, Шлезвіг, Эльмсгорн. Размешчана на п-ве Ютландыя і Паўн.-Германскай нізіне. Клімат марскі. Шмат азёр і балот. Кільскі канал. Участкі букавых лясоў. Гаспадарка індустр.-агр. тыпу. Прам-сць: суднабудаванне, цяжкае, эл.-тэхн. і тэкст. машынабудаванне, чорная і каляровая металургія, тэкст., дрэваапр. і папяровая, харч., у т.л. рыбаперапрацоўчая. Здабыча нафты. Вырошчваюць збожжавыя культуры, цукр. буракі, бульбу. Агародніцтва (на маршавых землях і на в-ве Фемарн). Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней. Рыбалоўства. Гал. марскія парты: Любек, Кіль. Паромная сувязь з Фінляндыяй (Любек—Ханка). На ўзбярэжжы курорты.

Тэр. Ш.-Г. складаецца з 2 гіст. частак — Шлезвіг (б. герцагства) і Гольштэйн, аб'яднаных у 1386 гольштэйнскімі графамі. У 1460 рэгіён ва ўмовах асабістай уніі перайшоў пад кіраванне Даніі, але Гольштэйн (з 1474 герцагства) да 1806 фармальна ўваходзіў у «Свяшчэнную Рым. імперыю». У сярэдзіне 16 ст. тут праведзена Рэфармацыя. Паводле рашэнняў Венскага кангрэса 1814—15 Гольштэйн абвешчаны чл. Герм. саюза. Рух мясц. немцаў (складалі большасць насельніцтва) за незалежнасць ад Даніі і спробы дацкага ўрада захаваць уладу над гэтым рэгіёнам прывялі да *дацка-прускай вайны 1848—50* і *дацкай вайны 1864*. Пасля апошняй Шлезвіг перайшоў пад уладу Прусіі, Гольштэйн — Аўстрыі, але ў выніку аўстра-прускай вайны 1866 увесь Ш.-Г. адышоў да Прусіі і стаў яе правінцыяй. Пасля 1-й сусв. вайны Паўн. Шлезвіг, з пераважна дацкім насельніцтвам, у выніку плебісцыту адышоў да Даніі (1920). Пасля 2-й сусв. вайны ў брыт. зоне акупацыі Германіі ўтворана зямля Ш.-Г. (1946), якая ў 1949 увайшла ў склад ФРГ. *У.Я.Калаткоў.*

ШЛЕ́ЗІНГЕР (Schlesinger) Артур Меер Малодшы (н. 15.10.1917, г. Калумбус, штат Агайо, ЗША), амерыканскі паліт. гісторык. Скончыў Гарвардскі ун-т (1938), у 1946—61 праф. у ім, з 1966 — у Нью-Йоркскім ун-це. У 1961—64 пам. прэзідэнтаў ЗША Дж.Ф.*Кенэдзі* і Л.Б.*Джонсана*. У 1940—50-я г. развіваў ідэю лібералізму як асн. рухаючай сілы грамадскага прагрэсу, з канца 1950-х г. — канцэпцыю т.зв. дэмакр. прагрэсу, паводле якой здольнасць ЗША станоўча вырашаць свае супярэчнасці спрыяла паступоваму ператварэнню амер. грамадства ў грамадства сац. справядлівасці. У 1960-я г. асуджаў ваен. ўмяшанне ЗША у справы В'етнама. Асн. працы: «Эпоха Джэксана» (1945), «Жыццёвы цэнтр» (1949), «Эпоха Рузвельта» (ч. 1—3, 1957—60), «Роберт Кенэдзі і яго час» (1978), «Цыклы амерыканскай гісторыі» (1986), «Раз'яднанне Амерыкі» (1992).

ШЛЕ́ЙДЭН (Schleiden) Матыяс Якаб (5.4.1804, г. Гамбург, Германія — 23.6.1881), нямецкі батанік; заснавальнік антагенетычных метадаў у батаніцы. Замежны чл. Пецярбургскай АН (1850). Скончыў Гайдэльбергскі ун-т (1827). Праф. батанікі ў Іенскім (1839—62, з 1850 дырэктар яго бат. сада) і антрапалогіі ў Дэрпцкім (1863—64) ун-тах. Навук. працы па анатоміі і эмбрыялогіі раслін. Распрацаваў антагенетычны падыход да вывучэння марфалогіі раслін. Працы Ш. адыгралі важную ролю ў абгрунтаванні Т.*Шванам клетачнай тэорыі*.

ШЛЕЙФАВА́ННЕ, выраўноўванне і частковае рыхленне ўзаранай глебы перад *сяўбой*. Стварае дробнакамякаваты слой, які перашкаджае выпарэнню вільгаці. Праводзяць шлейф-бараной ці валакушай на глебах лёгкага і сярэдняга грануламетрычнага складу.

ШЛЕМ, від *засцерагальнага ўзбраення*, галаўны ўбор. Бронзавыя і жалезныя Ш. ўваходзілі ў рыштунак воінаў стараж. Грэцыі і Рыма (у пахаваннях правадыроў і цароў знаходзяць Ш. з серабра і золата). На Беларусі асн. тыпамі Ш. у 10—17 ст. былі шышак, прылбіца, капалын, штурмак, місюрка. Яны мелі розную форму, былі адкрытыя і з засцерагальнымі элементамі (рухомай лічынай-забралам, навушамі, напатылічнікам, *барміцай*). У рэгулярных арміях Ш. з жалеза існавалі да сярэдзіны 19 ст. У пач. 20 ст. на змену ім прыйшла *каска*.

Да арт. **Шлем**: 1 — місюрка-наплечнік паручніка панцырнай харугвы. Вялікае княства Літоўскае, 17 ст.; 2 — каска «літоўскага ўзору» мушкецёра 1-га пяхотнага палка. Рэч Паспалітая, 1789.

Спец. галаўны ўбор у шэрагу родаў сучасных войск (мотастралкоў, танкістаў, лётчыкаў і інш. (гл. таксама *Шлемафон*). Элемент індывід. рыштунку лётчыкаў, вадалазаў, касманаўтаў (гл. *Скафандр*). Галаўны засцерагальны ўбор тыпу Ш. выкарыстоўваецца таксама ў прам-сці, спорце і інш.

М.Я.Шлейдэн.



Г.Шліман.

ШЛЕМАФО́Н, спецыяльны галаўны ўбор у выглядзе *шлема* з 2 *тэлефонамі* і малаадчувальным да вонкавых акустычных шумаў *мікрафонам* (або 2 *ларынгафонамі*), прызначаны для ўнутр. або (і) знешняй сувязі ва ўмовах вял. шуму (напр., у танках, самалётах, касм. караблях і інш.).

ШЛЁМНІК (Scutellaria), род кветкавых раслін сям.. губакветных (яснотковых). Каля 300 відаў. Пашыраны ўсюды. На Беларусі 2 віды Ш.: звычайны (S.galericulata) і кап'ялісты (S.hastifolia). Трапляюцца па берагах рэк, азёр, нізінных балот, у хмызняках. Культывуюцца Ш. байкальскі (S.baicalensis) і высокі (S.altissima).

Шматгадовыя травы, паўкусты і кусцікі выш. ад 3 да 100 см. Лісце рознай формы — ад суцэльных да перыстарассечаных. Кветкі (па 2) у аднабокіх кальчаках, размешчаных у пазухах прыкветнага ліста, часта збліжаныя ў густое гронка- або коласападобнае суквецце. Плод — 4-арэшак. Карані Ш. байкальскага выкарыстоўваюцца ў медыцыне. Лек., фарбавальныя і дэкар. расліны. *Дз.І.Трацякоў.*

Шлёмнік: 1 — звычайны; 2 — малы.

ШЛЁНСКАЕ ВАЯВО́ДСТВА (Województwo Śląskie), Сілезскае ваяводства, адм.-тэр. адзінка на Пд Польшчы. Утворана 1.1.1999. Пл. 12,1 тыс. км^2. Нас. 4,9 млн. чал. (1999), гарадская 80%. Адм. ц. — г. *Катавіцы*. Найб. гарады: Чанстахова, Сасновец, Бытам, Глівіцы, Забжэ, Бельска-Бяла, Руда-Шлёнска, Тыхы, Дамброва-Гурніча, Хожаў. Большую ч. тэр. займае Шлёнскае ўзв., на ПнУ — Кракаўска-Чанстахоўскае ўзв., на Пд — Зах. Бяскіды. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад -2,5 °С да -5 °С, ліп. 17,5—18 °С, ападкаў 650—1200 мм за год. Гал. рэкі Одра і Вісла. Глебы падзолістыя, бурыя, у далінах рэк — алювіяльныя. Лясы займаюць каля 30% тэр. Ш.в. — індустр. рэгіён, у межах якога знаходзіцца ч. *Верхнесілезскага — Астраўска-Карвінскага каменнавугальнага басейна* і *Верхнесілезскі рудны раён*. Прам-сць: гарнарудная, чорная і каляровая металургія, электраэнергетыка, машынабудаванне, хім., сілікатна-керамічная, харчовая. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 50% тэр. Вырошчваюць бульбу, жыта; агародніцтва. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней, авечак. Цэнтры турызму і адпачынку (Вісла, Шчырк, Устрань, Ястшэмбе-Здруй і інш.).

ШЛЁЦЭР (Schlözer) Аўгуст Людвіг (5.7.1735, г. Гагштат, цяпер Кірхберг, Германія — 9.9.1809), нямецкі гісторык, філолаг, статыстык. Ганаровы чл. Пецярб. АН (1769) і Т-ва гісторыі і старажытнасцей расійскіх (1804). Вучыўся ў Вітэнбергскім і Гётынгенскім ун-тах (Германія), у 1761—67 працаваў у Расіі. Прыхільнік *нарманскай тэорыі*. Садзейнічаў публікацыі «Гісторыі Расійскай» В.М.*Тацішчава*, у 1763—64 склаў граматыку рус. мовы. Пасля вяртання ў Германію выкладаў гісторыю і статыстыку ў Гётынгенскім ун-це, напісаў шэраг прац па рас. гісторыі, з якіх гал. «Нестар» станоўча паўплывала на развіццё рас. крыніцазнаўства. З асветніцкіх пазіцый развіваў ідэю «сусв. гісторыі», выступаў супраць падзелу народаў на «гістарычныя» і «негістарычныя».

Літ.: Черепнин Л.В. А.Л.Шлецер и его место в развитии русской исторической науки // Международные связи России в XVII—XVIII вв. М., 1966.

ШЛІК (Schlick) Морыц (14.4.1882, Берлін — 22.6.1936), аўстрыйскі філосаф і фізік, адзін з лідэраў ранняга этапа *лагічнага пазітывізму*, заснавальнік *Венскага гуртка*. Скончыў Берлінскі ун-т. Праф. ва ун-тах Ростака (1917—20), Кіля (1921—22), Вены (1922—36, заг. кафедры), Каліфарнійскага ун-та (1931—32). У кн. «Усеагульная тэорыя пазнання» (1918) сфармуляваў ідэі, пазней пакладзеныя пазітывістамі ў аснову сваёй дактрыны, у прыватнасці вучэнне аб аналіт. прыродзе логікі і матэматыкі і прынцып *верыфікацыі*. Абгрунтоўваў безумоўны прыярытэт эмпірычных ведаў. Лічыў, што ў пазнанні перадаюцца толькі структурныя адносіны пачуццёвага вопыту, паўтаральнасць у ім парадку. На яго думку, праблема пазнання сутнасці быцця бессэнсоўная, а законы прыроды — толькі фармальныя правілы, якія вызначаюцца сінтаксісам той мовы, на якіх робіцца іх апісанне. Патрабаванне эмпірычнага абгрунтавання навук. ведаў пашыралася ім і на філасофію прыродазнаўства (праблема навук. асэнсавання прасторава-часавых меркаванняў у фізіцы), і на галіну этыкі, дзе ён разглядаў пытанні свабодных, не вызначаных прымусовым характарам паводзін («Прастора і час у сучаснай фізіцы», 1917; «Пытанні этыкі», 1930).

А.Б.Савеня.

ШЛІ́МАН (Schliemann) Генрых (16.1.1822, г. Нойбукаў, Германія — 26.12.1890), нямецкі археолаг, даследчык ант. культуры. Адукацыю атрымаў самастойна. У 1846—64 жыў у Пецярбургу. На ўласныя сродкі, зароблены гандлем, праводзіў археал. раскопкі з мэтай знайсці стараж. помнікі, згаданыя ў эпасе *Гамера*. У 1870 пачаў раскопкі на ўзгорку Гісарлык на зах. узбярэжжы М.Азіі, дзе адкрыў руіны *Троі*. Праводзіў раскопкі *Мікен*, Архамена, Тырынфа, на а-вах Ітака і Крыт (1870—86); вынікі сваіх раскопак апублікаваў у творах «Ітака, Пелапанес і Троя» (1869), «Мікены» (1878), «Іліён» (1881), «Троя» (1884), «Аўтабіяграфія» (выд. 1892). Нягледзячы на асобныя памылкі, даказаў, што ранні грэч. перыяд (2-е тыс. да н.э.), які спецыялісты-класікі лічылі легендарным, мае фактычную аснову. Адкрыў эгейскую культуру (гл. *Крыта-Мі-*

кенская культура), якую пасля смерці Ш. даследавалі А.Дж.*Эванс*, В.Дзёрпфельд і інш.

Літ.: Штоль Г. Шлиман: Пер. с нем. М., 1965; Меерович М. Шлиман. М., 1966; Ванденберг Ф. Золото Шлимана: Пер. с нем. Смоленск, 1996.

ШЛІСЕЛЬБУ́РГСКАЯ КРЭ́ПАСЦЬ, помнік гісторыі і архітэктуры 14—20 ст., на в-ве Арэхавым каля вытоку р. Нява з Ладажскага воз. ў межах г. Шлісельбург Ленінградскай вобл. Расіі. Засн. ў 1323 наўгародцамі пад назвай Арэшак. У 1353 абнесена каменнай сцяной з вежамі, пазней неаднаразова перабудоўвалася. Мела 7 вежаў (захавалася 5), сцены таўшчынёй да 6 м, унутр. гавань (не захавалася). У пач. 18 ст. ўмацавана 7 бастыёнамі. У 1611 у час *Смуты* пасля шматмесячнай аблогі захоплена Швецыяй і перайменавана ў Нотэбург. У час *Паўночнай вайны 1700—21* 22.10.1702 штурмам узята рус. войскамі пад камандаваннем *Пятра I* і перайменавана ў Шлісельбург (ням. «ключ-горад»). У 1-й чвэрці 18 ст. страціла ваен. значэнне, у 1810 раззброена. Да 1872, у 1884—1905 і 1908—17 выкарыстоўвалася як паліт. турма з цяжкім рэжымам.

Сярод яе вязняў былі скінуты імператар *Іван VI*, асветнік М.І.*Навікоў*, некаторыя дзекабрысты, польскі рэвалюцыянер В.*Лукасінскі*, вынаходнік падводнай лодкі ўраджэнец Беларусі К.Г.*Чарноўскі*, народнікі М.А.*Бакунін*, В.М.*Фігнер*, М.А.*Морозаў* і інш., кіраўнік польскай партыі *«Пралетарыят»* Л.*Варынскі* (памёр), эсэры, сацыял-дэмакраты, бальшавікі і інш. рэвалюцыянеры. З 1928 музей. У Вял. Айч. вайну ням.-фаш. войскі з вер. 1941 да студз. 1943 акупіравалі г. Шлісельбург, але Ш.к., якую 500 дзён гераічна абараняў невял. сав. гарнізон, не здолелі захапіць. Крэпасць моцна разбурана. Вядзецца яе рэстаўрацыя, дзейнічае музей.

ШЛІФ (ням. Schliff ад schleifen тачыць, шліфаваць), тонкая (0,02—0,03 мм) пласцінка (зрэз) горнай пароды, мінералу або выкапнёвага вугалю, прызначаная для іх мікраскапічных даследаванняў у праходзячым, звычайна палярызаваным, святле.

Вырабляецца падшліфоўкай адной з паверхняў невял. *штуфа*, наклейкі яе на прадметнае шкло і сточвання да патрэбнай таўшчыні; на тонкую пласцінку наклейваюць покрыўнае шкло (у якасці клею выкарыстоўваюць канадскі бальзам або інш. смолы). Пры спец. даследаванні Ш. можа быць і без покрыўнага шкла. Для непразрыстых горных парод і мінералаў вырабляюць *аншліфы*. Ш. выкарыстоўваюцца ў петраграфіі, мінералогіі і пры пошуках карысных выкапняў.

ШЛІФАВА́ЛЬНЫ СТАНО́К, станок для апрацоўкі вырабаў *абразіўным інструментам* (*шліфаваннем*). Металарэзныя Ш.с. выкарыстоўваюць для надання дэталям дакладных памераў і правільнай геам. формы, змяншэння шурпатасці паверхняў, пры *фінішных метадах апрацоўкі*, заточванні рэжучых інструментаў, абразанні загатовак, а таксама для абдзіркі загатовак, атрыманых коўкай, ліццём, штампоўкай.

Падзяляюцца на кругла-, унутры-, плоска-, бясцэнтрава-шліфавальныя; заточныя, паліравальныя, даводачныя і інш.; універсальныя і спецыялізаваныя, прызначаныя для шліфавання пэўных дэталей (зубчастых колаў, каленчатых валоў, турбінных лапатак і да т.п.). Вярчэнне шліфавальнага круга — ад індывід. электрарухавіка праз раменную перадачу, дэталей — ад асобнага прывода з бесступеньча-

Разнавіднасць **шліфавальнага станка** — плоскашліфавальны паўаўтамат з лічбавым праграмным кіраваннем Аршанскага станкабудаўнічага завода.

тым рэгуляваннем. Прывод зваротна паступальных перамяшчэнняў сталоў і бабак гідраўлічны, падачы на глыбіню — мех. або гідраўлічны. Тэндэнцыі ўдасканалення Ш.с. — павышэнне дакладнасці апрацоўкі, павелічэнне частаты вярчэння шпіндэля, выкарыстанне лічбавага праграмнага кіравання, накіравальных качэння, адаптыўных сістэм і інш. На Беларусі металарэзныя Ш.с. выпускаюць Аршанскі станкабуд. з-д «Чырвоны барэц», віцебскія станкабуд. з-ды «Вістан» і «ВІЗАС», Гомельскі станкабуд. з-д імя С.М.Кірава і інш.

Дрэваапрацоўчыя Ш.с. падзяляюць на стужачныя, цыліндравыя (барабанныя), дыскавыя, бабінныя, шчотачныя і камбінаваныя.

Дэталі пры апрацоўцы прыціскаюцца да рабочага органа (або наадварот). У некат. выкарыстоўваецца мех. падача загатовак. Усе станкі маюць пылапрыёмнікі. У *каменеапрацоўцы* пашыраны т.зв. рукаўныя Ш.с., у якіх лёгка мяняецца становішча інструмента пры апрацоўцы, і настольныя Ш.с. Пры масавай апрацоўцы абліцовачных вырабаў выкарыстоўваюць аўтаматыз. Ш.с. партальнага, кансольнага ці маставога тыпу. *Дз.Ф.Усціновіч.*

ШЛІФАВА́ННЕ (ад польск. szlifować, ням. schleifen тачыць, паліраваць, шліфаваць), 1) апрацоўка матэрыялаў *абразіўным інструментам*. Робіцца на *шліфавальных станках*, часам уручную пры дапамозе электраінструментаў.

Ш. апрацоўваюць цыліндрычныя, канічныя і фасонныя вонкавыя і ўнутр. паверхні, вырабы з загартаваных легіраваных сталей і сплаваў, з керамікі, шкла, каменя, драўніны, бетону. У метала- і каменеапрацоўцы для Ш. карыстаюцца кругамі, брускамі, сегментамі і інш., у дрэваапрацоўцы — шліфавальнымі стужкамі на папяровай, тканкавай або сінт. аснове. Цяжкаапрацоўвальныя дэталі шліфуюць электралітычным спосабам. Ш. атрымліваюць высокадакладныя дэталі (6—9-га квалітэту) і гладкія паверхні (8—12-га класа шурпатасці). На Беларусі навук. даследаванні па Ш. вядуцца з 1950-х г. на Мінскім падшыпнікавым з-дзе, у Фізіка-тэхн. ін-це Нац. АН, Бел. нац. тэхн. ун-це і інш.

2) У крупяной вытв-сці Ш. — выдаленне зародка і вонкавых частак ядра, наданне драблёным зерням пэўнай формы і аднароднасці. Паляпшае смакавыя якасці круп, але зніжае колькасць вітамінаў і мінер. рэчываў. *Дз.Ф.Усціновіч.*

ШЛІ́ФЕН (Schliffen) Альфрэд фон (28.2.1833, Берлін — 4.1.1913), германскі ваен. дзеяч. Граф. Ген.-фельдмаршал (1911). Скончыў афіцэрскае вучылішча (1853) і ваен. акадэмію (1861). У якасці афіцэра генштаба ўдзельнічаў у аўстрапрускай аперацыі 1866 і франка-прускай 1870—71 вайне. У 1891—1905 нач. генштаба. З 1906 у адстаўцы. Адзін з ідэолагаў герм. мілітарызму і тэорыі скарацечнай вайны. Паслядоўнік К.*Клаўзевіца* і Г.К.Б.*Мольтке* Старэйшага, адстойваў ідэю акружэння арміі праціўніка шляхам стратэг. ахопу і разгрому ў вял. ген. бітве, перабольшваў ролю палкаводцаў у вайне, адмаўляў магчымасць франтальнага прарыву. Аўтар герм. плана вайны на два фран-



Некаторыя асноўныя схемы **шліфавання**: вонкавае круглае з падоўжнай (1) і папярочнай (2) падачамі; з вялікай глыбінёй рэзання (3); стужачнае (4); плоскае шліфаванне перыферыяй (5) і тарцом (6) круга; бясцэнтравае вонкавае (7).

ты — супраць Францыі і Расіі (1905), ідэю якога герм. фашысты паклалі ў аснову тэорыі *«маланкавай вайны»*.

Літ.: Царев Н.Т. От Шлиффена до Гинденбурга. М., 1956.

ШЛІХ (ням. Schlich), канцэнтрат цяжкіх мінералаў (самароднае золата, алмаз, магнетыт, касітэрыт і інш.), які застаецца пасля прамыўкі рыхлых прыродных адкладаў або здробненых горных парод ці мінералаў. У склад Ш. ўваходзяць зярняты мінералаў са шчыльн. больш за 3 г/см^3, устойлівыя да фіз. і хім. выветрывання. Аналіз Ш. (вызначэнне і апісанне мінералаў па фракцыях) праводзіцца з дапамогай бінакулярнага мікраскопа і інш. метадамі. Выкарыстоўваецца Ш. пры пошуках россыпных і карэнных радовішчаў.

Літ.: Захарова Е.М. Шлиховой метод поисков полезных ископаемых. М., 1989.

ШЛІХТАВА́ННЕ (ад ням. Schlichte шліхта) у ткацтве, насычэнне нітак *асновы* тканіны клейкімі рэчывамі (шліхтай); адзін з падрыхтоўчых працэсаў *ткацтва*. Павялічвае супрацьўленне нітак сціранню і расцягванню іх на *ткацкім станку*.

Для прыгатавання шліхты выкарыстоўваюць *крухмал, полівінілавы спірт*, поліакрыламід і інш.; растваральнік — вада. Ш. выконваецца на шліхтавальных машынах. Ніткі асновы, што змотваюцца са снавальных валікаў, апускаюцца ў ванну са шліхтай, адціскаюцца паміж валамі і паступаюць у сушыльны апарат для выдалення лішку вільгаці. Пад Ш. не падпадаюць кручаныя ніткі, а таксама сінт. і шаўковыя, што маюць дастатковую гладкасць і трываласць.

ШЛІ́ХТЫНГ Альберт, нямецкі дваранін з Памераніі, аўтар двух твораў пра Расію сярэдзіны 16 ст. У 1564 трапіў у рус. палон. У 1568—70 перакладчык і слуга ў прыдворнага ўрача А.Ленэя. Увосень 1570 уцёк у ВКЛ (Літву), дзе ў 1571 склаў кароткую запіску: «Навіны з Масковіі, перададзеныя дваранінам А.Шліхтынгам аб жыщі і тыраніі гасудара Івана», а пазней «Кароткае сказанне аб характары і лютым праўленні Маскоўскага тырана Васілевіча», дзе падрабязна апісаў *апрычніну* і апрычны тэрор.

Тв.: Рус. пер. — Новое известие о России времени Ивана Грозного. 4 изд. Л., 1935.

Літ.: Зимин А.А. Опричнина Ивана Грозного. М., 1964; Зимин А.А., Хорошкевич А.Л. Россия времени Ивана Грозного. М., 1982; Скрынников Р.Г. Начало опричнины. Л., 1966; Яго ж. Великий государь Иоан Васильевич Грозный. Т. 1—2. Смоленск, 1996.

ШЛІ́ХТЫНГ (Schlichting) Сігізмунд Вільгельм фон (3.10.1829, Берлін — 22.10.1909), германскі ваен. дзеяч. Ген. ад інфантэрыі (1896). У арміі з 1847. Займаў камандныя і штабныя пасады, удзельнік аўстра-прускай аперацыі 1866 і франка-прускай вайны 1870—71. Аўтар шэрагу тэарэт. прац па стратэгіі і тактыцы. У працы «Асновы сучаснай тактыкі і стратэгіі» (1897—99) спрабаваў абагульніць вопыт войнаў 2-й пал. 19 ст. Выступаў паслядоўнікам К.*Клаўзевіца* і Г.К.Б.*Мольтке* Старэйшага. Ваенна-тэарэт. погляды Ш., асабліва на ролю ген. бітвы ў вайне, на *сустрэчны бой*, рассыпны строй і інш., знайшлі адлюстраванне ў статутах герм., яп. і інш. армій перад 1-й сусв. вайной.

Літ.: Кеммерер. Развитие стратегической науки в XIX столетии: Пер. с нем. М., 1938.

А.А.Шлык.

ШЛО́СЕР (Schlosser) Фрыдрых Крыстаф (17.11.1776, г. Евер, Германія — 23.9.1861), нямецкі гісторык. З 1817 праф. Гайдэльбергскага ун-та. У працах «Гісторыя 18 стагоддзя...» (т. 1—2, 1823), «Сусветная гісторыя...» (т. 1—19, 1844—57) з маралістычна-асветніцкіх пазіцый выступаў супраць рамант. апалогіі сярэдневякоўя і феад. дэспатызму, у абарону ідэалаў *Асветніцтва* і бурж. рэвалюцый 16—18 ст. Імкнуўся стварыць гісторыю ўсяго чалавецтва як адзінага цэлага, на першы план ставіў становішча і жыццё нар. мас.

ШЛЫК Аляксандр Аркадзевіч (1.11.1928, Мінск — 30.11.1984), бел. вучоны ў галіне біяхіміі і біяфізікі фотасінтэзу. Чл.-кар. Рас. АН (1966). Д-р біял. н. (1963), праф. (1965). Скончыў БДУ (1950). З 1950 у Ін-це біялогіі АН Беларусі. З 1957 заг. лабараторыі біяфізікі і ізатопаў, з 1973 дырэктар створанага на яе базе Ін-та фотабіялогіі АН Беларусі. Навук. працы па біягенезе пігментнага апарату фотасінтэзу; абгрунтаваў існаванне і высветліў асн. заканамернасці працэсу аднаўлення хларафілу, выявіў метабалічную гетэрагеннасць пігментаў; паказаў, што хларафіл *b* сінтэзуецца з лабільных малекул хларафілу *a*; стварыў канцэпцыю цэнтраў біясінтэзу хларафілу і высветліў асн. прынцыпы іх функцыянавання.

Тв.: Метод меченых атомов в изучении биосинтеза хлорофилла. Мн., 1956; Метаболизм хлорофилла в зеленом растении. Мн., 1965; Chlorophyle biosynthesis in etiolated and greening leaves // Adwances in Photosynthesis Research. The Hague, 1984. *С.С.Мельнікаў.*

ШЛЮБ, гістарычна абумоўленая і санкцыяніраваная форма адносін паміж мужчынам і жанчынай, якая ўстанаўлівае іх пэўныя правы і абавязкі адзін да аднаго, да іх дзяцей і грамадства, упарадкоўвае і рэалізуе прыродную патрэбу людзей у прадаўжэнні роду. У большасці сучасных дзяржаў, у т.л. на Беларусі, закон патрабуе адпаведнага афармлення (рэгістрацыі) Ш. ў спец. дзярж. органах. У некат. краінах прававое значэнне таксама надаецца і Ш., які заключаецца па царк. абрадах.

У эпоху першабытнага статка Ш. не было. Існавалі нічым не абмежаваныя адносіны паміж паламі, якія выклікаліся біял. патрэбамі. Першай грамадскай санкцыяй, што рэгулявала адносіны паміж мужчынам і жанчынай, была забарона палавых зносін паміж блізкімі сваякамі. У выніку гэтай забароны дашлюбнае грамадства трансфармавалася ў супольнасць, дзе панаваў групавы Ш. (мужчыны адной групы маглі ўступаць у палавыя зносіны з жанчынамі другой групы). Пазней пры першабытнаабшчынным ладзе групавы Ш. саступіў месца парнаму, які ў працэсе распаду ператвараўся ў манагамны Ш. (гл. *Манагамія*) і стаў асновай сучаснага тыпу *сям'і* з эгалітарнай структурай.

Заканадаўства Рэспублікі Беларусь (Кодэкс аб шлюбе і сям'і ад 1.9.1999 і інш. прававыя акты) устанаўлівае і рэгулюе парадак і ўмовы ўзяцця Ш., замацоўвае правы і абавязкі членаў сям'і. Ш. бярэцца ў дзярж. органах, якія рэгіструюць акты грамадз. стану. Рэгістрацыя ўзяцця Ш. ўстанаўліваецца з мэтай аховы асабістых і маёмасных правоў мужа, жонкі і дзяцей, а таксама ў інтарэсах грамадства і дзяржавы. Прававыя асновы параджае толькі Ш., зарэгістраваны азначаным парадкам.

Літ.: Харчев А.Г. Брак и семья в СССР. 2 изд. М., 1979; Сысенко В.А. Устойчивость брака: Пробл., факторы, условия. М., 1981; Энгельс Ф. Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы. Мн., 1970.

Э.І.Кузьмянкова.

ШЛЮ́БСКІ Аляксандр Ануфрыевіч (16.6.1897, в. Межава Расонскага р-на Віцебскай вобл. — 1941), бел. этнограф, фалькларыст, бібліёграф. Скончыў Віцебскае аддз. Маскоўскага археал. ін-та (1922). У 1918—23 удзельнічаў у арганізацыі архіваў у Веліжы, Віцебску, Оршы, Полацку. З 1923 у Інбелкульце, у 1929—30 у Ін-це гісторыі АН Беларусі. Друкаваўся ў часопісах «Наш край», «Полымя», «Маладняк», газ. «Савецкая Беларусь». Склаў разгорнутую інструкцыю «Звесткі па збіранні вуснай народнай творчасці ў Беларусі» (1919). Выступаў з артыкуламі пра культ.-асв. жыццё Віцебшчыны, Мінска, пра падзеі грамадз. вайны на Беларусі, пра гісторыю бел. л-ры, перыяд. друку: «Канфіскацыя твораў Дуніна-Марцінкевіча» (1923), «Да гісторыі канфіскацыі «Нашай нівы» (1925), «Мужыцкая праўда» К.Каліноўскага» (1926). Даследаваў стараж. вераванні, матэрыяльную культуру беларусаў. Аўтар нарысаў-партрэтаў Е.Раманава, М.Нікіфароўскага, З.Бядулі, У.Дабравольскага. Асн. яго працы — бібліягр. даведнік «Матэрыялы да беларускае бібліяграфіі» (т. 4. «Этнаграфія», 1927) і «Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны» (ч. 1—2, 1927—28) — не страцілі навук., грамадска-культ. каштоўнасці і ў наш час.

Тв.: Паны і сяляне ў першай палове XIX ст. Мн., 1924; Крашаніна (набіванка). Ві-

цебск, 1926; «Русальніца»: (Этнагр. нарыс) // Маладняк. 1926. № 9; К истории русской этнографии: Цензурные мытарства А.Н.Афанасьева // Сов. этнография. 1940. № 4.

Літ.: Бандарчык В.К. Гісторыя беларускай савецкай этнаграфіі. Мн., 1972.

А.С.Ліс.

ШЛЮЗ (галандскае sluis ад лац. excludo выключаю, утрымліваю, аддзяляю), 1) суднаходны Ш. — гідратэхн. збудаванне паміж вадаёмамі з рознымі ўзроўнямі вады, праз якое прапускаюць судны (плыты). Асн. часткі: камера (1 ці больш, размешчаных у паралельных нітках), галаўныя часткі (верхняя і ніжняя) з варотамі (затворамі), водаправодныя галерэі, механізмы кіравання, падыходы (каналы ці ўчасткі акваторыі з прычальнымі збудаваннямі). Ш.-рэгулятар выкарыстоўваецца для рэгулявання расходу і ўзроўню вады ў каналах. 2) Ш. у горнай справе — нахілены вузкі і доўгі жолаб з няроўнасцямі, на якіх затрымліваюцца цяжкія мінералы ці металы пры прапусканні па ім *пульпы*; адно з першых прыстасаванняў для золатаздабычы, вядомае са стараж. часоў. Ш. наз. таксама спец. збудаванне для разведкі ачагоў пажараў у шахтах і горных вырабатках; збудаванне для пропуску людзей, грузаў і трансп. сродкаў без парушэння вентыляцыі (вентыляцыйны Ш.), а таксама для рэгулявання паступлення і размеркавання паветра ў шахтавай вентыляцыйнай сетцы. Ш., шлюзавы адсек — камера (адсек) для выхаду (уваходу) людзей з герметычнага памяшкання (напр., кабіны касм. карабля, пнеўматычнай буд. канструкцыі) без парушэння герметызацыі.

ШЛЮП (ад нідэрл. sloep), 1) ветразевы трохмачтавы ваен. карабель 18—19 ст. для разведвальнай, дазорнай і пасыльнай службаў. Займаў прамежкавае становішча паміж *карветам* і *брыгам*.

Водазмяшчэнне 300—900 т, артыл. ўзбраенне — 16—32 гарматы. У Расіі ў 1-й пал. 19 ст. Ш. часта выкарыстоўвалі для кругасветных плаванняў і навук. экспедыцый (напр., Ф.Ф.*Белінсгаўзена*, М.П.*Лазарава* і інш.).

2) Ветразевае марское трансп. і рыбалоўнае аднамачтавае судна з кліверам — косым трохвугольным ветразем, што ўстанаўліваецца паміж фок-мачтай (гл. *Мачта*) і бушпрытам (гарыз. ці нахілены брус для ўмацоўвання насавых ветразяў) наперадзе стакселя (косы трохвугольны ветразь, што ўзнімаюць наперадзе мачты). Часам Ш. дадаткова забяспечваюць яшчэ адным кліверам і стакселем. Гл. таксама *Ветразь*.

3) Тып ветразевага рыштунку сучасных спарт. суднаў.

ШЛЮ́ПКА, агульная назва невял. бяспалубных ветразева-вяслярных ці маторных суднаў. Адрозніваюць Ш. трацавыя (*ял*) і з вострымі ўтварэннямі кармы (*вельботы*). Паводле прызначэння бываюць выратавальныя, рабочыя, карабельныя (*баркас, катэр*, тузік — лёгкая аднамесная двухвёславая Ш.) і інш.



Выратавальныя **шлюпкі**: 1 — металічная закрытага тыпу; 2 — з ручным прыводам да вінта.

ШЛЮ́ТЭР (Schlüter) Андрэас (каля 1660, г. Гданьск, Польшча — да 23.6.1714), нямецкі скульптар і архітэктар; прадстаўнік барока. З 1682 працаваў у Гданьску, з 1689 у Варшаве, з 1694 у Берліне. У 1702—04 дырэктар Берлінскай АМ. Сярод значных работ: у Берліне — галовы паміраючых воінаў на замкових камянях у двары цэйхгаўза (1696), конны помнік Фрыдрыху Вільгельму (т.зв. Вял. курфюст; 1696—1703, цяпер у двары палаца Шарлотэнбург), партрэтны бюст ландграфа Фрыдрыха II Гесен-Гамбургскага (каля 1704), унутр. двор і інтэр'еры Гар. палаца (1698—1706), віла Камеке (1711—12). З 1713 у Пецярбургу; паўплываў на станаўленне рус. барока пач. 18 ст.: аддзелка Летняга палаца Пятра I у *Летнім садзе*, праекты палаца Монплезір і гротаў у Пецяргофе (цяпер *Петрадварэц*).

ШЛЯ́ГА Мікалай Іванавіч (н. 1.5.1935, в. Перадрэйка Мазырскага р-на Гомельскай вобл.), генерал-палкоўнік (1990), дзеяч бел. дыяспары ў Расіі. Скончыў ВПШ пры ЦК КПСС (1972), Ваенна-паліт. акадэмію імя Леніна (1975). З 1958—76 на камсам., парт.-паліт. рабоце ў Бел. ваен. акрузе (БВА) і Групе сав. войск у Германіі. З 1976 інструктар, нам. заг. сектара аддзела адм. органаў ЦК КПСС. З 1983 1-ы нам. нач., з 1985 нач. палітупраўлення Цэнтр. групы войск, чл. Ваен. савета. З 1987 заг. сектара дзярж.-прававога аддзела ЦК КПСС. З 1988 1-ы нам. нач., з 1989 нач. Гал. паліт. ўпраўлення Сав. Арміі і ВМФ, чл. калегіі Мін-ва абароны СССР. У 1992—96 ген. дырэктар акц. т-ва па падрыхтоўцы кіруючых кадраў, з 1996 нам. дырэктара Цэнтра вучэбных і інфарм. тэхналогій Расіі. З 1998 старшыня рады рэгіянальнай нац.-культ. аўтаноміі «Беларусы Масквы». Акадэмік Міжнар. пед. акадэміі (1995).

Б.Дз.Далгатовіч, Р.Ч.Лянькевіч.

Шлюп «Мірны» (Расія, 1818).

А.Шлютэр. Партрэтны бюст ландграфа Фрыдрыха II Гесен-Гамбургскага. Каля 1704.

ШЛЯ́ГЕР (ням. Schlager ходкі тавар, цвік сезона), 1) пацяшальная танцавальная песня, звычайна на любоўна-лірычны тэкст, або інстр. п'еса сучаснай эстрады. Адна з гал. форм *поп-музыкі*, характэрны прадукт *масавай культуры*. Вылучаецца шаблоннасцю ў муз. і паэт. плане. 2) Асабліва папулярная песня, для якой характэрны яркія, запамінальныя дэталі мелодыкі, гармоніі ці аранжыроўкі, што адпавядае апошняй модзе; часта Ш. сам параджае моду на танц. формулу, аранжыровачны эфект і інш. 3) У пераносным сэнсе — любы муз. твор, а таксама твор інш. мастацтваў, які карыстаецца асабліваі папулярнасцю, але легкаважкі паводле сэнсу.

ШЛЯЙМО́ВІЧ Макс Моўшавіч (н. 14.10.1941, г. Пенза, Расія), бел. архітэктар. Скончыў БПІ (1969). З 1960 працаваў у Мінскгарпраекце, Віцебскім філіяле ін-та «Белдзяржпраект», у 1971—81 гал. архітэктар г. Наваполацк Віцебскай вобл., з 1981 кіраўнік майстэрні БелНДІПгорадабудаўніцтва, у 1986—2003 гал. архітэктар Наваполацкага філіяла ін-та «Віцебскгрампраект». Асн. работы: у Наваполацку — рэалізацыя генплана, праекты забудовы мікрараёнаў № 7, 8 і 9; у г. Полацк — мікрараёны 1, 2 і 3 у жылым раёне «Аэрапорт»; праекты жылых і грамадскіх будынкаў у Полацку і Наваполацку (усе 1960—80-я г.). Дзярж. прэмія Беларусі 1984.

ШЛЯНЦО́ЎСКІ (Szlancowski) Францішак (1751, Прага — 1827), танцоўшчык, балетмайстар і педагог. Творчае жыццё звязана з Чэхіяй, Польшчай, Беларуссю. Вучань Ж.Ж.*Навера*. У 1770—85 выступаў у Празе, Варшаве, дзе набыў рэпутацыю «першага танцоўшчыка гратэску», Вене, Англіі. З 1785 ці 1788 (да 1792) саліст і балетмайстар *Слонімскага тэатра Агінскага*, педагог *Слонімскай балетнай школы*, што абумовіла росквіт харэаграфічнага мастацтва мясц. трупы. Зімой 1790/91 выступаў са слонімскім ансамблем у г. Дубна (Украіна) ва ўласных балетах. У 1792—1808 (з перапынкамі) у Варшаве: балетмайстар у трупе Ф.Г. Ле Ду, у 1806 стварыў новы ансамбль у Нац. т-ры і паставіў з ім балеты «Кракаўцы і горцы», «Балет жней», «Балет млынароў» і інш. У 1808 пераехаў са сваім калектывам у г. Плоцк (Польшча), з 1811 настаўнік танцаў.

ШЛЯПЯ́НАЎ Ілья Юльевіч (9.11.1900, г. Чарнігаў, Украіна — 21.12.1951), расійскі рэжысёр, тэатр. мастак. Засл. арт. Расіі (1933). Скончыў Дзярж. вышэйшыя рэж. майстэрні пад кіраўніцтвам У.*Меерхольда* (1925). У 1923—26 мастак Т-ра імя Меерхольда, з 1928 гал. мастак і рэжысёр Т-ра Рэвалюцыі ў Маскве, у 1938—39 рэжысёр Малога т-ра оперы і балета, з 1944 гал. рэжысёр Ленінградскага т-ра оперы і балета. У 1939—40 маст. кіраўнік Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. У творчасці імкнуўся да глыбокага рэаліст. абагульнення падзей, натуральнасці масавых сцэн, вял. значэнне надаваў маст. афармленню спектакля. Сярод пастановак на бел. сцэне: «У пушчах Палесся» А.Багатырова (1939), «Кветка шчасця» А.Туранкова (1940), «Травіята» Дж.Вердзі (1941). Дзярж. прэміі СССР 1946, 1951.

Тв.: Статьи, заметки, высказывания: Современники о Шлепянове. М., 1969.

«ШЛЯХ», заходнебеларуская газета рэв.-дэмакр. кірунку. Выдавалася з 11.12.1932 да 12.1.1933 у Вільні на бел. мове. Асвятляла надзённыя пытанні паліт. і сац. жыцця Польшчы, аналізавала прычыны дыферэнцыяцыі сіл у вызв. руху Зах. Беларусі, адстойвала рэв. кірунак яго развіцця. Шмат увагі аддавала стану прам-сці і сельскай гаспадаркі. У рубрыках «На шырокім свеце», «Адусюль патрошку» з марксісцкіх пазіцый асвятляла паліт. сітуацыю ў Германіі напярэдадні яе фашызацыі, забастовачны рух у Іспаніі, падзеі на Д.Усходзе. Друкавала звесткі пра паліт. і культ. жыццё ў СССР, асабліва ў БССР. Інфармавала грамадскасць аб ходзе суда над Б.*Тарашкевічам* і кіраўнікамі Т-ва бел. школы. Асобнымі публікацыямі (пад крыптанімам «К.Р.») адзначыла 50-гадовыя юбілеі Я.Купалы і Я.Коласа. Выйшлі 4 нумары, з іх 3-і канфіскаваны. *А.С.Ліс.*

ШЛЯХ З «ВАРА́ГАЎ У ГРЭ́КІ», старажытны водны шлях (каля 2700 км), які праз унутр. водныя шляхі Русі звязваў Балтыйскае (Варажскае) м. з Чорным (Рускім) м., Скандынавію («варагаў») і Зах. Еўропу з Візантыяй («грэкамі») і краінамі Усходу. Выкарыстоўваўся з гандл. і ваен. мэтамі з 9 ст., найб. актыўна ў 10 — 1-й трэці 11 ст. Забяспечваў гандл. сувязі Русі з краінамі Захаду і Усходу. Паводле *«Аповесці мінулых гадоў»*, ішоў з Фін. заліва Балт. мора па р. Нява ў Ладажскае воз., адтуль па р. Волхаў у воз. Ільмень, з яго па р. Ловаць і яе прытоку р. Сярожа, далей судны перацягвалі па сушы да р. Тарапа, па ёй — у Зах. Дзвіну і па яе прытоку р. Каспля да воз. Каспля, адкуль волакам у вярхоўе р. Дняпро, па якім спускаўся да Чорнага м. Мелася некалькі адгалінаванняў шляху ад Зах. Дзвіны, у т.л. па рэках Ула і Усвейка, адтуль волакам у р. Друць і далей у Дняпро. Праз рэкі Дзясна і Сож шлях быў звязаны з прытокамі рэк Дон, Ака, Волга; праз Прыпяць з Зах. Бугам; па Зах. Дзвіне з Віцебскам, Полацкам і Прыбалтыкай. Скарбы араб., візант. і зах.-еўрап. манет сведчаць, што гал. гандлёвы шлях ішоў з Прыбалтыкі па Зах. Дзвіне да Віцебска, Далей па р. Каспля да Дняпра. Візант. імператар Канстанцін Багранародны (сярэдзіна 10 ст.) апісаў паўд. ч. шляху па Дняпры ў Візантыю.

Вясною купцы з Ноўгарада, Смаленска, Любеча, Чарнігава і інш. гарадоў на лодках-аднадрэўках спускаліся па Дняпры і яго прытоках і збіраліся ў Кіеве, адкуль у чэрвені судны з таварамі плылі па Дняпры да Чорнага м. з прыпынкамі на а-вах Хорціца і Бераэань. Уздоўж берагоў Чорнага м. шлях ішоў на З да Царграда (Канстанцінопаля) або на У у Крым і на Каўказ. Рус. купцы вывозілі з Русі футра, скуры, мёд, воск, рабоў; прывозі-

лі ў Русь залатыя і сярэбраныя ўпрыгожанні, каштоўныя тканіны, садавіну, віно, прыправы, вырабы са шкла і эмалі. У 11—12 ст. у сувязі з феад. драбленнем Русі, з'яўленнем у ніжнім Падняпроўі *полаўцаў*, устанаўленнем гандл. сувязей Зах. Еўропы з Б. Усходам праз Міжземнае м. шлях страціў значэнне.

Літ.: Бернштейн-Коган С.В. Путь из варяг в греки // Вопросы географии. М., 1950. Сб. 20; Свердлов М.Б. Транзитные пути в Восточной Европе IX—XI вв. // Изв. Всесоюз. Геогр. о-ва. 1969. Т. 101, вып. 6; Алексеев Л.В. По Западной Двине и Днепру в Белоруссии. М., 1974; Яго ж. Смоленская земля в IX—XIII вв.: Очерки истории Смоленщины и Восточной Белоруссии. М., 1980.

П.З.Савачкін.

«ШЛЯХ МО́ЛАДЗІ», заходнебеларускі маладзёжны грамадска-паліт. і літ.-маст. часопіс нац.-дэмакр. кірунку. Выдаваўся ў 1929—39 у Вільні на бел. мове (лацінкай і кірыліцай) напачатку штомесячна, з вер. 1937 — 2 разы на месяц. Рэдактары М.*Пецюкевіч*, Я.Найдзюк, Я.*Шутовіч*, выдавец Я.*Багдановіч*. Меў на мэце «змаганне за незалежнасць Беларусі і за паляпшэнне народнай долі шляхам абуджэння моладзі да народнай свядомасці, пашырэння асветы і культуры на вёсцы». Асн. рубрыкі: «З краю», «Хроніка», «Лісты», «Паштовая скрынка», «Што чуваць у свеце», «Для нашых малодшых». Знаходзіўся пад уплывам *Беларускай хрысціянскай дэмакратыі*, аднак імкнуўся адлюстроўваць погляды прадстаўнікоў розных ідэйна-паліт. плыняў. Выступаў супраць сац. і нац. ўціску зах.-бел. насельніцтва з боку польскіх улад. Змяшчаў падрабязную хроніку падзей грамадска-паліт. і культ. жыцця Зах. Беларусі, сачыў за падзеямі ў БССР, праяўляў цікавасць да міжнар. жыцця. На яго старонках друкаваліся творы бел. пісьменнікаў, гіст. працы і даследаванні, літ.-знаўчыя артыкулы, пераклады, палемічныя нататкі, рэцэнзіі, анатацыі. Шмат увагі аддаваў пытанням выхавання моладзі, падтрымліваў бел. скаўтаў. З 1938 выдаваў штомесячны дадатак «Шлях беларускага студэнта». Польскія ўлады 14 разоў канфіскоўвалі тыраж асобных нумароў. Выданне спынена ў вер. 1939.

А.М.Вабішчэвіч.

ШЛЯ́ХТА (польск. szlachta ад стараж.-верхненям. slahta род, парода), прывілеяванае саслоўе ў Беларусі, Літве, Польшчы, Украіне ў 13 — пач. 20 ст. Часам тэрмін «Ш.» ўжываўся ў Чэхіі, а ў 2-й чвэрці — сярэдзіне 18 ст. і ў Расіі для назвы дваранскага саслоўя. У ВКЛ і Рэчы Паспалітай Ш. займала пануючае становішча, эканам. падставай гэтага была феад. ўласнасць на зямлю. Ш. адыгрывала вял. ролю ў паліт., гасп. і культ. жыцці да канца 18 ст. Была вайсковым саслоўем, удзельнічала ў войнах. Ш. — асн. фактар у змаганні за аднаўленне дзяржаўнасці Польшчы і ВКЛ у паўстаннях 1794, 1830—31 і 1863—64.

У ВКЛ з 13 ст. асн. маса феадалаў называлася *баярамі*. З часоў *Гарадзельскага прывілея 1413* разам з назвай «баяры» ўсё часцей ужываўся тэрмін «баяры-шляхта», або «Ш.». Узаемаадносіны паміж рознымі групамі Ш. грунтаваліся на прынцыпах феад. іерархіі, што абумовіла эканам. залежнасць малазаможнай і незаможнай Ш. (гл. *Ваколічная шляхта, Чыншавая шляхта*) ад *магнатаў*. У 14—15 ст. з агульнай масы вылучаліся *князі* і *паны*. Дробная Ш. мела невял. ўчасткі зямлі з некалькімі сялянамі або без сялян. У 15—16 ст. значнай па колькасці была група ваеннаслужылага насельніцтва, пераходная паміж феадаламі і сялянамі (*панцырныя баяры, путныя баяры, зямяне, стральцы, слугі*). Ш. фарміравалася як вайск. саслоўе. Да 2-й чвэрці 15 ст. са Ш. вылучана самаст. катэгорыя ваен. слуг. Да сярэдзіны 16 ст. доступ у Ш. зрабіўся магчымым у рэдкіх выпадках праз набілітацыю (вял. князем, гетманам, з сярэдзіны 16 ст. — соймам). У пач. 16 ст. сярэднія і дробныя феадалы бел. паходжання складалі 80% усіх феадалаў Беларусі, 19% — літ. паходжання. Пасля Люблінскай уніі 1569 і ўтварэння Рэчы Паспалітай верхнія і сярэднія пласты Ш. паступова пачалі ўжываць польскую мову. Аднак *Статут Вялікага княства Літоўскага 1566* і *Статут Вялікага княства Літоўскага 1588* забаранялі набываць у ВКЛ зямельную ўласнасць іншаземцам, у т.л. польскай Ш. Ёй забаранялася займаць любыя дзярж. пасады ў ВКЛ. Каб забяспечыць падтрымку сваёй палітыкі, вял. князі ВКЛ юрыдычна замацоўвалі звычаі, што існавалі раней, і пашыралі правы феадалаў на ўзор прывілеяў Ш. ў Польшчы. Былі выдадзены *Прывілей 1387, Прывілей 1432, Прывілей 1434, Прывілей 1447, Прывілей 1492, Прывілей 1506, Судзебнік 1468*. Статуты ВКЛ 1529, 1566 і 1588 канчаткова замацавалі правы Ш. Пасля адм.-судовай рэформы 1565—66 Ш. атрымала права на самакіраванне праз павятовыя *соймікі* і вальны *сойм*, права выбару суддзяў усіх узроўняў да *Трыбунала Вялікага княства Літоўскага* уключна. Ш. выбірала кароля (пасля Люблінскай уніі). У Рэчы Паспалітай уся Ш. была роўнай у правах. Паводле Статута ВКЛ, шляхціц не мог быць арыштаваны і няслушна пакараны без рэчавых доказаў віны, а судзіць яго маглі толькі роўныя яму, г.зн. шляхецкі суд. Калі трэба было вырашаць пытанні карпаратыўных інтарэсаў, Ш. аб'ядноўвалася ў паліт. саюзы — *канфедэрацыі*. Поўнае панаванне Ш. прывяло да стварэння ў 16—18 ст. у Рэчы Паспалітай своеасаблівай шляхецкай рэспублікі. Адметная рыса бел. Ш. (як літ. і польскай) — яе шматлікасць (10—12% насельніцтва ў канцы 18 ст.). Ш. павінна была збірацца ў апалчэнне (*паспалітае рушэнне*), выстаўляць у войска 1 коннika з 5 валок зямлі.

Пасля далучэння ў канцы 18 ст. Беларусі да Рас. імперыі ў выніку 3 падзелаў Рэчы Паспалітай становішча Ш. змянілася. Яна была абмежавана ў прывілеях, пазбаўлена права збірацца на соймікі і выбіраць некат. суддзяў. Хоць царызм і пашырыў на Ш. Беларусі правы дваранства Рас. імперыі, аднак перавёў шматлікую дробную Ш. ў больш нізкія саслоўі з меншымі правамі (гл. *Разбор шляхты*). Ш. распачала вызв. рух на Беларусі, шляхецкі (дваранскі) перыяд якога прыпадае на 1794—1864. Шмат пацярпела Ш. Беларусі пасля падаўлення паўстанняў 1794, 1830—31 і 1863—64. Пераважна са Ш. выйшлі кіраўнікі бел. нац.-вызв. руху канца 19 — пач. 20 ст. з сацыяліст. поглядамі: К.Каганец, І. і А.Луцкевічы, В.Іваноўскі, Цётка, Я.Купала і інш. Больш заможная частка Ш., што была прызнаная ў дваранстве, аб'ядноўвалася ў карпаратыўныя структуры — губернскія і павятовыя дваранскія сходы. Лютаўская рэвалюцыя 1917 пазбавіла дваранскія арг-цыі паліт. ўплыву. 24.11.1917 СНК і Саўнарком РСФСР скасавалі дваранскае саслоўе і яго карпаратыўныя арг-цыі ў губернях і паветах. Прывілеі Ш. ў Польшчы, у т.л. ў Зах. Беларусі, скасаваны канстытуцыяй 1921. У першыя дзесяцігоддзі сав. улады прадстаўнікі былой Ш. падвяргаліся рэпрэсіям. Маса беднай Ш. ў вёсках падзяліла лёс сялянства, а ў гарадах увайшла ў склад рабочых і інтэлігенцыі. У Зах. Беларусі былая Ш. займалася гасп. і культ. дзейнасцю.

У 1990-я г. ў Беларусі ўзмацнілася цікавасць да гісторыі Ш. З'явіліся навук. публікацыі па гэтай тэме. У 1992 у Мінску створана навукова-грамадская патрыят. арг-цыя Згуртаванне беларускай шляхты, якая аб'яднала нашчадкаў шляхецкага (вайсковага) саслоўя. У 1993—97 згуртаванне выдавала час. «Годнасьць».

Літ.: Лаппо И.И. Великое княжество Литовское во второй половине XVI столетия: Литовско-рус. повет и его сеймик. Юрьев, 1911; Грыцкевіч А. Беларуская шляхта // Спадчына. 1993. № 1; Лойка П.А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI — першай трэці XVII ст. Мн., 2002; Жытко А.П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму, 1861—1914 гг. Мн., 2003; Sikorska-Kulesza J. Deklasacja drobnej szlachty na Litwie i Białorusi w XIX w. Warszawa, 1995.

А.П.Грыцкевіч.

ШЛЯХТУНО́Ў Уладзімір Іосіфавіч (н. 22.8.1936, в. Сінякова Шумілінскага р-на Віцебскай вобл.), бел вучоны ў галіне жывёлагадоўлі. Д-р с.-г. н. (1985), праф. (1988). Акад. Агр. АН Беларусі (1994, чл.-кар.1992). Скончыў Віцебскі вет. ін-т (1959). У 1984—90 у Бел. НДІ жывёлагадоўлі (з 1973 заг. лабараторыі, з 1987 дырэктар). З 1990 у Віцебскай акадэміі вет. медыцыны. Навук. працы па пытаннях тэхналогіі вытв-сці ялавічыны, павелічэння прадукцыйнасці буйн. раг. жывёлы і інш.

Тв.: Справочник по скотоводству. Мн., 1984 (у сааўт.); Повышение качества говядины. Мн., 1986 (разам з Г.І.Пляшчанка); Снижение потерь мясной продукции в процессе производства и реализации скота. Мн., 1987; Скотоводство и технология производства молока и говядины. Мн., 1997 (разам з В.С.Антанюком, Дз.М.Бубенам).

ШМА́КАЎ Фёдар Іванавіч (н. 1.3.1917, С.-Пецярбург), бел. акцёр, рэжысёр. Нар. арт. Беларусі (1959). Нар. арт. СССР (1975). Скончыў Ленінградскі тэатр. ін-т (1939, курс В.Мяркур'ева). З 1939 працаваў у Дзярж. рус. драм. т-ры

Беларусі ў Магілёве, з 1941 у Нац. акад. т-ры імя Я.Коласа, выкладаў у студыях пры т-ры. Акцёр шырокага творчага дыяпазону, валодае рэдкім сцэнічным абаяннем, шчырасцю. Яго мастацтву ўласцівы паглыбленая псіхал. характарыстыка вобразаў, лаканізм і прастата ў спалучэнні з яркімі тэатральна-выразнымі фарбамі. Лепшыя ролі стварыў на сцэне т-ра імя Я.Коласа ў нац. рэпертуары: Несцерка (аднайм. п'еса В.Вольскага), Коржань, Астап («Цэнтральны ход», «Алазанская даліна» К.Губарэвіча і І.Дорскага), Верас, Грушэўскі («Пяюць жаваранкі», «Блытаныя сцежкі» К.Крапівы), Аксён Каль («Навальніца будзе» паводле Я.Коласа), Лемяшэвіч, Яраш, Антанюк («Крыніцы», «Сэрца на далоні», «Снежныя зімы» паводле І.Шамякіна), Каравай («Таблетку пад язык» А.Макаёнка), Мураўёў («Кастусь Каліноўскі» У.Караткевіча). Сярод роляў класічнага і сучаснага рэпертуару: Пётр, Платон («Лес», «Праўда добра, а шчасце лепш» А.Астроўскага), Акім («Улада цемры» Л.Талстога), Сінцоў («Ворагі» М.Горкага), Мурамскі («Вяселле Кречынскага» А.Сухаво-Кабыліна), Гарацыо («Гамлет» У.Шэкспіра), Берлі («Марыя Сцюарт» Ф.Шылера), Сяргей Горлаў («Фронт» А.Карнейчука), Сяргей («Іркуцкая гісторыя» А.Арбузава), Васкоў («А досвіткі тут ціхія...» паводле Б.Васільева). Стварыў запамінальныя вобразы Леніна ў спектаклях І.Папова, Дз.Зорына, М.Шатрова, М.Пагодзіна. З 1960-х г. выступае і як рэжысёр. Сярод пастановак «Шануй бацьку свайго» В.Лаўрэнцьева (1964), «Бацькаўшчына» К.Чорнага (1966), «Семнаццаць імгненняў вясны» Ю.Сямёнава і У.Токарава (1970), «Трывога» А.Петрашкевіча, «Зберажы маю тайну» В.Сабко (абедзве 1974), «РВС» паводле А.Гайдара (1975), «Несцерка» В.Вольскага (1999). Зняўся ў фільмах «Узнятая цаліна», «Доўгія вёрсты вайны», «Крыніцы», «Першыя выпрабаванні», «Людзі на балоце», «Подых навальніцы» і інш. Дзярж. прэмія Беларусі 1968. *Т.Дз.Арлова.*

У.І.Шляхтуноў.

Ф.І.Шмакаў.

І.І.Шмальгаўзен.

ШМА́КАЎКА, бальнеатэрапеўтычны курорт у Прыморскім краі Расіі, у даліне р. Усуры, на схіле г. Курортная. Засн. ў 1933.

Клімат кантынент. з цёплым летам. Асн. лек. фактар — крыніцы мінер. вод (вуглякіслыя гідракарбанатныя магніева-кальцыевыя воды з мінералізацыяй да 1,5 г/л і колькасцю вуглекіслаты да 3,86 г/л), якія выкарыстоўваюць на пітное лячэнне, ванны, душы і інш. Лечаць захворванні сардэчна-сасудзістай і нерв. сістэм, органаў страваванння. Санаторыі, курортная паліклініка, пітная галерэя.

ШМАЛЬГА́ЎЗЕН Іван Іванавіч (23.4.1884, Кіеў — 7.10.1963), украінскі і рас. біёлаг, заолаг, тэарэтык эвалюц. вучэння. Акад. Укр. АН (1922) і Рас. АН (1935). Засл. дз. нав. Украіны (1935). Сын І.Ф.*Шмальгаўзена*. Скончыў Кіеўскі ун-т (1907). Вучань А.М.*Северцава*. Праф. Варонежскага (з 1918), Кіеўскага (з 1921) і Маскоўскага (1939—48) ун-таў. У 1930—41 дырэктар Ін-та заалогіі і біялогіі Укр. АН, у 1936—48 дырэктар Ін-та эвалюц. марфалогіі і экалогіі жывёл, у 1948—63 у Заал. ін-це (з 1955 заг. лабараторыі) Рас. АН. Навук. працы па параўнальнай анатоміі і эмбрыялогіі, эвалюц. марфалогіі, заканамернасцях росту жывёл, фактарах і заканамернасцях эвалюцыі, біякібернетыцы. Стварыў тэорыю стабілізуючага адбору (1938—46).

Тв.: Кибернетические вопросы биологии. Новосибирск, 1968; Факторы эволюции: Теория стабилизирующего отбора. 2 изд. М., 1968; Организм как целое в индивидуальном и историческом развитии: Избр. тр. М., 1982; Пути и закономерности эволюционного процесса: Избр. тр. М., 1983.

Літ.: Шмальгаузен О.И. И.И.Шмальгаузен (1884—1963). М., 1988. *А.С.Леанцюк.*

ШМАЛЬГА́ЎЗЕН Іван Фёдаравіч (15.4.1849, С.-Пецярбург — 19.4.1894), расійскі батанік, адзін з заснавальнікаў палеабатанікі ў Расіі. Чл.-кар. Пецярб. АН (1893). Бацька І.І.*Шмальгаўзена*. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1871). З 1879 праф. Кіеўскага ун-та. Навук. працы па палеабатаніцы і флярыстыцы (па выкапнёвых раслінах дэвону, карбону, пермі, юры, трацічнага перыяду, выкапнёвай драўніне). Аўтар зводак па флоры паўд. рэгіёнаў Расіі.

ШМАРЛО́ЎСКАЯ Галіна Аляксандраўна (н. 3.6.1952, Мінск), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1997), праф. (2000). Скончыла Бел. ін-т нар. гаспадаркі (1973). З 1973 эканаміст ВА «Гарызонт», з 1977 у Бел. эканам. ун-це (з 2000 заг. кафедры). Навук. працы па праблемах макраэканам. стабілізацыі сусв. эканомікі, дзярж. і наднац. рэгуляванні (у т.л. мытнага і падатковага рэгулявання інвестыцыйных працэсаў), гандлі, функцыянаванні транснац. карпарацый, гісторыі эканам. вучэнняў.

Тв.: Теория налогов: закономерности формирования и гос. регулирования. Мн., 1996; Мировая экономика. Ч. 1. Мн., 1998 (разам з Н.У.Чарчэнка, А.В.Мельнікавай); Бюджетно-налоговое регулирование: Теория и практика. Мн., 2000; История экономических учений. 2 изд. Мн., 2001 (у сааўт.); Теории интерэкономики. Мн., 2001 (разам з А.Я.Лябедзька, А.М.Петрушкевіч); Концепции и теории трансформации экономических систем. Мн., 2002 (у сааўт.); Развитие экономической мысли учеными БГЭУ в 60—80-е гг. Мн., 2003 (у сааўт.).

ШМА́РЫНАЎ Дзяменцій Аляксеевіч (12.5.1907, Казань, Татарстан — 31.8.1999), расійскі графік. Нар. маст. СССР (1967).

Ф.Шмакаў у ролі Мурамскага (у цэнтры).

Дз.Шмарынаў. Вяртанне. З серыі «Не забудзем, не даруем!». 1942.

Правадз. чл. АМ СССР (1953). Вучыўся ў маст. студыях М.Прахава ў Кіеве (1919—22), Дз. Кардоўскага і К.Чэмка ў Маскве (1923—28). Працаваў пераважна ў кніжнай графіцы. Творы вылучаюцца рэаліст. дакладнасцю ў выяўл. інтэрпрэтацыі літ. твораў, перакананасцю выяўлення гіст. асяроддзя, драм. сітуацый, сац. і псіхал. характарыстык герояў: іл. да твораў А.Пушкіна «Аповесці Белкіна» (1937—49), «Дуброўскі» (1949), «Капітанская дачка» (1949—74), «Пікавая дама» (1949—76), да раманаў Л.Талстога «Вайна і мір» (1953—76), Ф.Дастаеўскага «Злачынства і кара» (1935—36), А.Талстога «Пётр I» (1940—45), Э.Хемінгуэя «Па кім звоніць звон» (1979). У 1941—45 выканаў шэраг плакатаў і цыкл станковых малюнкаў «Не забудзем, не даруем!» (1942). Стварыў шэраг жывапісных твораў. Дзярж. прэмія СССР 1943. Ленінская прэмія 1980.

Літ.: Чегодаев А.Д. Мои художники. М., 1974.

ШМА́ТАЎ Віктар Фёдаравіч (н. 9.5.1936, г.п. Камарын Брагінскага р-на Гомельскай вобл.), бел. мастацтвазнавец, мастак. Д-р мастацтвазнаўства (1990). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1962). З 1966 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нац. АН Беларусі (з 1991 заг. аддзела і заг. Музея стараж.-бел. культуры). Даследуе кніжную і станковую графіку Беларусі, маст. спадчыну Ф.Скарыны. Аўтар манаграфій «Сучасная беларуская графіка, 1945—1977» (1979), «Беларуская кніжная гравюра XVI—XVIII стст.» (1984), «Мастацтва кнігі Францыска Скарыны» (1990), «Мастацтва беларускіх старадрукаў XVI—XVIII стст.» (2000), кніг пра мастакоў М.Філіповіча (1971), А.Пасляловіч (1975), С.Геруса (1979), М.Сеўрука (1980), Л.Асецкага (1983), раздзелаў па бел. графіцы для «Гісторыі мастацтва народаў СССР» (т. 9, М., 1982). Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускага мастацтва» (т. 1—5, 1987—92), кніг «Францыск Скарына» (1979, на франц. мове; 1980, на англ. мове). Складальнік зб.

В.Ф.Шматаў.

«Выяўленчае мастацтва Беларусі» (1981). Працуе ў станковым жывапісе: «Беларускія старадрукі», «Акно (памяці Ф.Скарыны)» (абодва 1976), «Ліра 1863 г.» (1978), «Маці» (1979, 1993), «Лірнік (прысвячэнне Я.Купалу)» (1982), серыя «Чарнобыльская трагедыя» (1986—2000). Аўтар пейзажаў, шаржаў, карыкатур, сатыр. плакатаў, экслібрысаў.

Тв.: Беларуская сатырычная графіка (1945—1970 гг.). Мн., 1971; Беларуская графіка 1917—1941 гг. Мн., 1975; Беларускі кніжны знак. Мн., 1975 (разам з А.Тычынам); Беларуская станковая графіка. Мн., 1978.

І.Л.Чэбан.

В.Шматаў. Палескія крыжы. З серыі «Чарнобыльская трагедыя». 1986—2000.

ШМАТВА́ЛІКАВАЙ КЕРА́МІКІ КУЛЬТУ́РА, археалагічная культура плямён бронзавага веку, якія ў 17—16 ст. да н.э. жылі на тэр. Малдовы, стэпавай і паўд. раёнаў лесастэпавай Украіны, у бас. Дона. Адметная арнаментам з наляпных валікаў на гліняным посудзе (адсюль назва). Вылучана С.С.Бярэзанскай у 1960, якая адрознівае 4 яе варыянты: паўднёва-заходні, сярэднедняпроўскі, ніжнедняпроўскі, усходні (данецкі). Найб. блізкі да Беларусі сярэднедняпроўскі варыянт, паўн. мяжа якога даходзіць да Прыпяці. На тэр. Бел. Падняпроўя фрагменты посуду гэтай культуры часцей трапляюцца з матэрыяламі сярэдняй ці позняй бронзы, чым з матэрыяламі *сярэднедняпроўскай культуры*.

Літ.: Березанская С.С. Культура многоваликовой керамики // Культуры эпохи бронзы на территории Украины. Киев, 1986.

ШМАТГАДО́ВАЯ МЕРЗЛАТА́, тое, што *вечная мерзлата*.

ШМАТГАДО́ВЫЯ РАСЛІ́НЫ, мнагалетнікі, дрэвы і кусты, а таксама травяністыя расліны і паўкусты, што жывуць больш за 2 гады. Цвітуць і пладаносяць шматразова (*полікарпічныя расліны*) або раз у жыцці (*монакарпічныя расліны*). У некат. Ш.р. лісце захоўваецца ўвесь год (*вечназялёныя расліны*), у інш. — ападае ў неспрыяльныя перыяды (*лістападныя лясы*). У большасці *травяністых раслін* зімой або ў перыяд засухі надземныя парасткі адміраюць, жывымі застаюцца падземныя органы (карэнішчы, клубні, цыбуліны, карані). У многіх траў часткова захоўваюцца надземныя парасткі з прыземнымі пупышкамі ўзнаўлення (разеткі, паўзучыя парасткі, ніжнія ч. прамастойных сцёблаў).

ШМАТГАЛО́ССЕ, музычны склад, заснаваны на адначасовым гарманічным спалучэнні некалькіх *галасоў*; процілеглае *манодыі*. У Ш. вылучаюць *гамафонію, поліфанію*. Прамежкавы стан паміж аднагалоссем і Ш. займае *гетэрафанія*. Магчыма адначасовае спалучэнне розных тыпаў Ш.

ШМАТДО́МНЫЯ РАСЛІ́НЫ, палігамныя расліны, кветкавыя расліны, якія разам з двухполымі кветкамі маюць аднаполыя. На адной і той жа расліне бываюць двухполыя і мужчынскія кветкі (напр., чамярыца), двухполыя і жан. кветкі (напр., многія складанакветныя), двухполыя, мужчынскія і жан. кветкі (напр., конскі каштан). У аднаго віду на адных асобінах бываюць двухполыя кветкі, на другіх — мужчынскія (напр., курапатчына трава) або жан. (напр., многія губакветныя). Двухполыя, мужчынскія і жан. кветкі могуць таксама быць на розных экзэмплярах (напр., вінаград, ясень). Паміж усімі тыпамі магчымы пераходы. Шматдомнасць у раслін спрыяе перакрыжаванаму апыленню.

ШМАТЗЛУ́ЧНІКАВАСЦЬ, полісіндэтан, стылістычны прыём, пры якім усе ці пераважная большасць аднародных членаў сказа звязаны адным злучнікам. Нярэдка ўжываецца ў фальклоры:

Напісана, запячатана,
Каб нікому не паказвала,
Каб без вады было выбелена,
Каб без сонца было высушана,
Без валачка слізка выкачана.
(Бел. нар. песня)

Ш. запавольвае тэмп паэт. мовы, павышае яе экспрэсіўнасць, памагае вылучаць асобныя найб. значныя паводле сэнсу словы:

Ідзе-брыдзе за следам след,
І ноч, і дзень, і цьма, і свет,
І песні кліч, і смерці цвет,
Ідзе-брыдзе за следам след.
(Я.Купала. «За годам год»)

Стыліст. прыём, процілеглы Ш., — *бяззлучнікавасць*.

А.А.Майсейчык.

ШМАТКАЛЯРО́ВЫ ДРУК, каляровы друк, спосаб паліграфічнага ўзнаўлення на паперы, тканіне, інш. матэрыялах шматколерных відарысаў (твораў жывапісу, фотаздымкаў) некалькімі фарбамі.

Асн. віды Ш.д.: друкаванне асобных участкаў або элементаў шматколернага відарыса фарбамі розных колераў без накладання іх адзін на адзін (выкарыстоўваецца, напр., пры *картадрукаванні*; друкаванне з накладаннем фарбаў адна на адну пры 3-фарбавым сінтэзе ўсіх колераў (пры *рэпрадукцыі* твораў жывапісу, каляровых фатаграфій). У апошнім выпад-

ку карыстаюцца толькі празрыстымі фарбамі (жоўтай, пурпуровай, блакітнай) і карэкціровачнай шэрай або чорнай. Адрозніваюць 2 спосабы Ш.д.: накладанне другой і наступных фарбаў пасля высыхання (замацавання) на адбітку папярэдняй фарбы; накладанне фарбаў за адзін друкарскі цыкл з малым інтэрвалам часу, калі наступная фарба кладзецца на вільготны слой папярэдняй (друкаванне «па сырым»). Апошні спосаб найб. прагрэсіўны і можа выконвацца ўсімі спосабамі друку. У Ш.д. шырока выкарыстоўваюцца працэсы *колерадзялення*.

Літ.: Технология печатных процессов. М., 1989; Полянский Н.Н. Основы полиграфического производства. 2 изд. М., 1991; Шашлов Б.А. Цвет и цветовоспроизведение. М., 1986.

У.М.Сацута.

ШМАТКАНА́ЛЬНАЯ РАДЫЁСУ́ВЯЗЬ, многаканальная радыёсувязь, сістэма *радыёсувязі*, якая з дапамогай спец. тэхналогіі забяспечвае адначасовую перадачу некалькіх паведамленняў па адным фіз. радыёканале. Гл. таксама *Лічбавае радыёвяшчанне, Лічбавае тэлебачанне, Многаканальная сувязь*.

ШМАТКАНА́ЛЬНАЯ СУ́ВЯЗЬ, тое, што *многаканальная сувязь*.

ШМАТКЛЕ́ТАЧНЫЯ, арганізмы (жывёлы, расліны, грыбы), цела якіх складаецца з многіх спецыялізаваных клетак і іх вытворных (розныя віды міжклетачнага рэчыва). Характэрная іх адзнака — якасная нераўназначнасць клетак, іх дыферэнцыроўка і аб'яднанне ў комплексы рознай складанасці (тканкі і органы), якія выконваюць розныя функцыі ў цэласным арганізме. Для Ш. характэрна таксама індывід. развіццё (*антагенез*), якое пачынаецца ў большасці выпадкаў (выключаючы вегетатыўнае размнажэнне) з дзялення адной клеткі (*зіготы, споры*). Большасць Ш. размнажаецца палавым, ніжэйшыя Ш. (губкі, кішачнаполасцевыя, кольчатыя і плоскія чэрві) і бясполым шляхам. Самыя стараж. Ш. (губкі, археацыяты, кішачнаполасцевыя) вядомы з пратэразою. Гл. таксама *Аднаклетачныя*.

Літ.: Иванов А.В. Происхождение многоклеточных животных. Л., 1968.

ШМАТКРО́П'Е, гл. ў арт. *Знакі прыпынку*.

ШМАТМО́ЎЕ, полілінгвізм, 1) валоданне і папераменнае карыстанне асобай некалькімі мовамі (індывід. Ш.). 2) Адначасовае суіснаванне ў адным калектыве або ў адным тэр.-адм. аб'яднанні некалькіх моў, якія ў сукупнасці выконваюць функцыі моўных зносін і ўтвараюць адзіную сацыяльна-камунікатыўную сістэму (сац. Ш.).

Сац. Ш. існуе толькі пры наяўнасці індывідуальнага. Можа быць роўнафункцыянальным (калі ўсе мовы ў аднолькавай ступені выконваюць функцыі моўных зносін) і няроўнафункцыянальным (мовы выконваюць неаднолькавую колькасць функцый моўных зносін). На Беларусі Ш. існавала здаўна. На працягу 18 ст. ўжываліся бел., польская, царк.-слав., лац. і рус. мовы, хоць у паліт. і сац. адносінах яны займалі неаднолькавае становішча. У сучасны перыяд у некат. пагранічных раёнах Беларусі існуе бел.-рус.-польскае, бел.-рус.-літоўскае Ш. Гл. таксама *Двухмоўе*.

Літ.: Жураўскі А.І. Двухмоўе і шматмоўе ў гісторыі Беларусі // Пытанні білінгвізму і ўзаемадзеяння моў. Мн., 1982; Швейцер А.Д., Никольский Л.Б. Введение в социолингвистику. М., 1978; Вайнрайх У. Языковые контакты. Киев, 1982.

А.А.Лукашанец.

ШМАТСТУПЕ́ННЫЯ ВЫ́БАРЫ, выбарчая сістэма, пры якой дэпутаты прадстаўнічага органа выбіраюцца ніжэйстаячымі выбарнымі органамі або выбарчымі калегіямі. У склад калегій уваходзяць выбраныя насельніцтвам выбаршчыкі ці дэпутаты ніжэйстаячых прадстаўнічых органаў або тыя і другія. Ш.в. могуць мець 2 і больш ступеняў (выбары ў 3, 4 ступені рэдкія). Двухступеннымі выбарамі, напр., выбіраюцца прэзідэнты ЗША, Фінляндыі, верхняя палата парламента Індыі. Трохступеннымі выбарамі фарміруецца частка сената Францыі: выбаршчыкі галасуюць за муніцыпальных саветнікаў, якія назначаюць дэлегатаў, што выбіраюць сенатараў.

ШМАТСТУПЕ́НЬЧАТАЯ РАКЕ́ТА, састаўная *ракета* з двума і больш *ракетнымі ступенямі*. Мае значна большыя скорасці і далёкасці палёту, чым 1-ступеньчатыя ракеты той жа стартавай масы. Шматступеньчатымі звычайна робяць *ракеты-носьбіты* («*Саюз*», «*Спейс шатл*» і інш.), стратэгічныя ракеты.

Выконваюцца з паслядоўным і паралельным размяшчэннем ступеней. Пры паслядоўным злучэнні (тандэм) кожная ступень цалкам адпрацоўвае і аддзяляецца, далей уключаецца рухавік наступнай ступені. Пры паралельным злучэнні (пакетныя схемы) ступені могуць працаваць адначасова (магчыма паралельнае злучэнне 1-й і 2-й ступеней, паслядоўнае 2-й і 3-й). Ідэі Ш.р. вядомыя з 16—17 ст. (К.*Семяновіч*, В.Себіш і інш.). Асновы разліку і прынцыпы пабудовы Ш.р. распрацаваў К.Э.*Цыялкоўскі*. У 20 ст. пытаннямі Ш.р. займаліся Р.*Годард*, адзін з піянераў касманаўтыкі А.І.*Шаргей* (1897—1941), Г.*Оберт*, А.А.Штэрнфельд і інш.



Схема **шматступеньчатай ракеты** з паслядоўным размяшчэннем ступеней: 1 — ракетны рухавік; 2 — вузлы сувязі ступеней; 3 — сістэма кіравання; 4 — баявая частка; 5 — паліўныя бакі.

Ф.Шменкель.

ШМАТФАТО́ННЫЯ ПРАЦЭ́СЫ, працэсы ўзаемадзеяння эл.-магн. выпрамянення з рэчывам, якія суправаджаюцца паглынаннем (выпрамяненнем) 2 ці больш фатонаў. Выяўляюцца ў дастатковa магутных светлавых палях; іх шырокія даследаванні пачаліся пасля з'яўлення *лазераў*. Ш.п. выкарыстоўваюцца ў аптычных пераўтваральніках частаты, генератарах камбінацыйных частот (камбінацыйных лазерах). Працэсы, дзе канечны квантавы стан рэчыва супадае з пачатковым, закладзены ў аснову генерацыі гармонік, сумарных і рознасных частот лазернага выпрамянення, параметрычных генератараў святла. Гл. таксама *Нелінейная спектраскапія*.

ШМЕ́ЛЬКІН Ханон Ёселевіч (15.2.1902, г. Укмерге, Літва — 4.8.1977), бел. цымбаліст. Засл. арт. Беларусі (1955). У 1923—26 музыкант Чырвонаармейскага духавога аркестра. У 1930—58 (з перапынкам) артыст Дзярж. нар. аркестра Беларусі. У 1928—58 выступаў у дуэце з С.*Навіцкім*, адначасова ў 1928—30 — таксама з І.*Жыновічам*. У рэпертуары бел., рус., укр. нар. песні, творы муз. класікі.

ШМЕ́НКЕЛЬ (Schmenkel) Фрыц (14.2.1916, г. Варзаў, Германія — 22.2.1944), нямецкі антыфашыст, Герой Сав. Саюза (1964). З 1938 у арміі, у кастр. 1939 з-за нязгоды служыць фашызму дэзерціраваў, за што быў асуджаны ўладамі. У 1941 яфрэйтар вермахта Ш. накіраваны на Усх. фронт. Восенню 1941 ён пакінуў сваю часць і перайшоў да партызан атрада «Смерць фашызму» на Смаленшчыне. За выкананне адказных заданняў ўзнагароджаны ордэнам Чырв. Сцяга (1943). У снеж. 1943 пры выкананні баявога задання схоплены фашыстамі і прывезены ў Мінск. 15.2.1944 прыгавораны да пакарання смерцю. Кінематаграфісты Германіі і Беларусі знялі пра Ш. фільм «Я хачу вас бачыць» (1978).

ШМЕ́Я Іван Сцяпанавіч (29.6.1921, г. Віцебск — 30.1.1998), поўны кавалер ордэна Славы. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Зах., 1-м Прыбалт. франтах. Камандзір разведаддзялення мал. сяржант Ш. вызначыўся ў час разведкі: у кастр. 1944 на ПнЗ ад г. Шаўляй (Літва) падбіў 2 аўтамашыны, захапіў кулямёт; 25.1.1945 каля г. Тыльзіт (Германія) сабраў звесткі аб праціўніку і паланіў 34 гітлераўцы; 8.4.1945 пры штурме Кёнігсберга ў тыле ворага з групай разведчыкаў знішчыў 2 кулямётныя кропкі і паланіў 42 гітлераўцы. Пасля вайны да 1981 на вытворчасці.

ШМІТ (Schmidt) Гельмут (н. 23.12.1918, г. Гамбург, Германія), дзяржаўны і паліт. дзеяч ФРГ, эканаміст. Скончыў Гамбургскі ун-т (1949). У 1953—62 і 1965—87 дэп. бундэстага, дзе ў 1967—69 узначальваў с.-д. фракцыю. У 1961—65 міністр унутр. спраў зямлі Гамбург. З 1969 міністр абароны, у 1972 міністр гаспадаркі і фінансаў, са снеж. 1972 міністр фінансаў ФРГ ва ўрадзе В.*Бранта*. У 1974—82 федэральны канцлер, у вер. 1982 адначасова міністр замежных спраў ФРГ. Працягваў знешнепаліт. курс Бранта, у т.л. ў галіне *разрадкі* міжнар. напружанасці і нармалізацыі адносін з ГДР. Ва ўнутр. палітыцы асн. ўвагу аддаваў барацьбе з тэрарызмам, вырашэнню энергет., эканам. і сац. праблем. Разам з В.*Жыскар д'Эстэнам* ініцыраваў стварэнне *Еўрапейскай валютнай сістэмы*. *У.Я.Калаткоў.*

ШМІТ (Schmidt) Іаганес (29.7.1843, г. Прэнцлаў, Германія — 4.7.1901), нямецкі мовазнавец. Чл.-кар. Пецярб. АН (1892). Вывучаў індаеўрап. мовы ва ун-тах Берліна і Іены. Праф. ва ун-тах Граца (з 1873), Берліна (з 1876). Асн. працы ў галіне *параўнальна-гістарычнага мовазнаўства* і *індаеўрапеістыкі*. У процівагу схеме А.*Шлайхера* аб «генеалагічным дрэве» як мадэлі члянення індаеўрап. моўнай сям'і прапанаваў (з Г.Шухартам) «хвалевую тэорыю» распаўсюджвання індаеўрап. моў, якая прывяла да прызнання дыялект. асаблівасцей індаеўрап. прамовы. Увёў панятце ізаглосы. З 1880 далучыўся да *младаграматызму*.

ШМІТ Ота Юльевіч (30.9.1891, г. Магілёў — 7.9.1956), расійскі матэматык, астраном і геафізік, дзярж. дзеяч, адзін з арганізатараў асваення Паўн. марскога шляху. Акад. АН СССР (1935, чл.-кар. 1933), АН УССР (1934). Герой Сав. Саюза (1937). Скончыў Кіеўскі ун-т (1913), дзе і працаваў. З 1926 праф. Маскоўскага ун-та. У 1932—39 нач. Гал. ўпраўлення Паўн. марскога шляху. У 1937—48 дырэктар Геафіз. ін-та АН СССР. У 1939—42 віцэ-прэзідэнт АН СССР. Адзін з заснавальнікаў і гал. рэдактар 1-га выдання Вял. Сав. Энцыклапедыі (1924—41). Навук. працы па тэорыі груп, геафізіцы, геаграфіі, касмагоніі, пытаннях асветы, фінансаў і інш. Упершыню ў СССР даследаваў матэм. законы грашовай эмісіі (1923). Даў матэм. абгрунтаванне наяўнасці жал. руд на Курскай магн. анамаліі (1923). Даказаў тэарэму аб прамых здабытках груп (1928; тэарэма Рэмака — Ш.). Сфармуляваў (1944) новую касмаганічную тэорыю «халоднага» ўтварэння Зямлі і планет з дапланетнага газапылавога воблака (гл. *Касмагонія*). У складзе

О.Ю.Шміт.



Х.Шміт.

першай сав.-герм. экспедыцыі даследаваў ледавікі Паміра (1928). Узначальваў экспедыцыі на ледаколе «Г.Сядоў» на Зямлю Франца-Іосіфа (1929—30), на параходзе «Чэлюскін» (1933—34; гл. *Чэлюскінцы*); на ледаколе «Сібіракоў» упершыню за адну навігацыю прайшоў увесь Паўн. марскі шлях (1932). У 1937 кіраваў паветр. экспедыцыяй па арганізацыі першай у свеце дрэйфуючай навук. станцыі «Паўн. полюс-1», у 1938 — аперацыяй па знятці персаналу станцыі з ільдзіны. Яго імем наз. востраў у Карскім моры, паўвостраў у паўн. ч. Новай Зямлі, мыс у Чукоцкім моры, пік і перавал на Паміры, раўніна ў Антарктыдзе, кратэры на Марсе і Месяцы, малая планета. Рас. АН заснавана прэмія імя Ш. за лепшыя навук. працы ў галіне даследавання і асваення Арктыкі.

Тв.: Избр. труды. Т. 1—3. М., 1959—60; Происхождение Земли и планет. М., 1962.

Літ.: О.Ю.Шмидт: Жизнь и деятельность. М., 1959; Дуэль И.И. Линии жизни. М., 1977; Якушева Г.В. О.Ю.Шмидт — энциклопедист. М., 1991; Матвеева Л.В. О.Ю.Шмидт, 1891— 1956. М., 1993.

М.М.Касцюковіч.

ШМІТ Пётр Пятровіч (17.2.1867, г. Адэса, Украіна — 19.3.1906), дзеяч рэвалюцыі 1905—07 у Расіі. Капітан 2-га рангу (1905). Скончыў Марское вучылішча ў Пецярбургу (1886) і служыў у ВМФ. З 1898 плаваў на суднах гандл. флоту. У 1904 (у сувязі з рус.-яп. вайной) мабілізаваны і ў 1905 прызначаны камандзірам мінаносца на Чарнаморскім флоце. У пач. рэвалюцыі 1905—07 арганізаваў у Севастопалі «Саюз афіцэраў — сяброў народа», актыўна выступаў на мітынгах і набыў вял. папулярнасць сярод рабочых і матросаў. Яго паліт. погляды вызначаліся эклектызмам: падзяляў эсэраўскую праграму сацыялізацыі зямлі, адмаўляў рэв. тэрор. За прамову на пахаванні расстраляных рабочых (1.11.1905) арыштаваны, але неўзабаве вызвалены і звольнены ў адстаўку ў чыне капітана 2-га рангу (у гісторыю рэвалюцыі ўвайшоў як лейтэнант Ш.). Па просьбе матросаў узначаліў *Севастопальскае паўстанне 1905*, у час якога абвясціў сябе каманд. Чарнаморскім флотам. Пасля разгрому паўстання арыштаваны і паводле прыгавору ваен. суда расстраляны. *М.Г.Нікіцін.*

ШМІТ (Schmitt) Харысан (н. 3.7.1935, г. Санта-Рыта, ЗША), касманаўт ЗША. Д-р геал. н. (1964). Скончыў Каліфарнійскі тэхнал. ін-т (1957). У 1965—75 у групе касманаўтаў НАСА. 7—19.12.1972 з Ю.*Сернанам* і Р.*Эвансам* здзейсніў (як пілот месяцавай кабіны) палёт на касм. караблі «Апалон-17». На Месяцы прабыў 75 гадз, у т.л. зрабіў 3 выхады на яго паверхню агульнай працягласцю 22,1 гадз. У космасе правёў 12,6 сут. Залаты медаль НАСА «За выдатныя заслугі». *У.С.Ларыёнаў.*

ШМІТ Якаў Іванавіч (Ісаак, Якаб; 25.10.1779, г. Амстэрдам, Нідэрланды — 20.9.1847), расійскі ўсходазнавец. Акад. Пецярб. АН (1831). Даследаваў манг. і тыбецкую мовы. Першы ўвёў вывучэнне манг. мовы і л-ры ў еўрап. навуку. Аўтар першай граматыкі манг. мовы (1831), граматыкі тыбецкай мовы (1839), слоўнікаў. Пераклаў на рус. мову манг. эпас «Подзвігі Багды Гесер хана» (1836).

ШМІ́ТА МЫС, П а ў н о ч н ы, на ПнУ Азіі, на ўзбярэжжы Чукоцкага мора. Палярная станцыя (з 1932). Названы імем О.Ю.*Шміта*.

ШМІ́ТА ПАДЛЁДНАЯ РАЎНІ́НА, вялікае паніжэнне падлёднай паверхні Усх. Антарктыды на Пд ад 70° паўд. ш. Абмежавана на З падлёднымі гарамі Гамбурцава і Галіцына. Б.ч. раўніны знаходзіцца ніжэй узр. м.; таўшчыня ледавіковага покрыва над ёй 3—4 тыс. м. Адкрыта ў 1957—59 сав. антарктычнай экспедыцыяй (з дапамогай сейсмазандзіравання). Названа ў гонар О.Ю.*Шміта*.

ШМІ́ТА ПАЎВО́СТРАЎ, паўночны край в-ва *Сахалін*, у Сахалінскай вобл. Расіі. Даўж. каля 50 км. Гарысты, асн. хрыбты Заходні і Усходні (выш. да 623 м) падзелены лагчынай. Балоты. Лістоўнічныя і яловыя лясы. Названы імем рас. геолага, палеантолага і батаніка Ф.Б.Шміта.

ШМЫ́ГА Іван Сцяпанавіч (30.1.1896, в. Дабраволя Свіслацкага р-на Гродзенскай вобл. — 14.6.1978), генерал-лейтэнант (1945). Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1931), Генштаба (1938). У арміі з 1915, у Чырв. Арміі з 1918 на Паўд. і Усх. франтах. З 1940 нач. аддзела Генштаба Чырв. Арміі. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Зах., Паўн.-Зах., Варонежскім, 1-м Укр. франтах: нам. нач.

штаба арміі, нач. аператыўнага аддзела штаба фронту, нач. штаба і нам. камандуючага арміяй, камандзір стралк. корпуса. Удзельнік Курскай бітвы, вызвалення Украіны, Польшчы, Чэхаславакіі. Да 1956 на выкладчыцкай рабоце ў Ваен. акадэміі імя Фрунзе, потым у МУС СССР.

ШМЫ́ГА Таццяна Іванаўна (н. 31.12.1928, Масква), расійская артыстка аперэты (лірычнае сапрана). Нар. арт. СССР (1978). Скончыла Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва імя А.Луначарскага (1953). З 1953 вядучая салістка Маскоўскага т-ра аперэты. Для яе выканаўчай манеры характэрны высокае вак., драм. і танц. майстэрства. Сярод роляў: Віялета, Нінон («Фіялка Манмартра» І.Кальмана), Марфа, Чаніта, Глорыя Разеці («Дзявочы перапалох», «Пацалунак Чаніты», «Цырк запальвае агні» Г.Мілюціна), Тоня («Белая акацыя» І.Дунаеўскага), герцагіня Гераль штэйнская («Вялікая герцагіня Гераль штэйнская» Ж.Афенбаха), Эліза Дулітл («Мая цудоўная лэдзі» Ф.Лоу) і інш. Здымалася ў кіно. Дзярж. прэмія Расіі імя М.Глінкі 1974.

ШМЫГУ́Н Аркадзь Карпавіч (20.9.1908, в. Старая Шараёўшчына Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл. — 16.4.1945), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў курсы лейтэнантаў (1936), «Выстрал» (1938). У Чырв. Арміі з 1930, да 1943 на выкладчыцкай рабоце. У Вял. Айч. вайну з вер. 1944 на 1-м Бел. фронце. Полк на чале з маёрам Ш. вызначыўся ў баях на тэр. Польшчы і Германіі ў ходзе *Вісла-Одэрскай аперацыі 1945*. Загінуў у час прарыву эшаланіраванай абароны праціўніка на подступах да Берліна.

ШМЫРО́ВА М.П. МЕМАРЫЯ́ЛЬНЫ МУЗЕ́Й. Створаны 24.3.1966 у г. Віцебск як гарадскі, з 1.1.1969 абласны, адкрыты 5.7.1969. Пл. экспазіцыі 216 м^2, 6413 адзінак асн. фонду, 4 залы (2002). Экспазіцыя знаёміць з жыццём і дзейнасцю М.П.*Шмырова*, гісторыяй стварэння і дзейнасці партыз. атрада «Бацькі Міная», 1-й Бел. партыз. брыгады, барацьбой партызан па абароне Суражскай партыз. зоны; уключае карту-схему разгрому варожага гарнізона ў г.п. Сураж у 1941, схему размяшчэння партыз. аэрадромаў, дыярыуш «Начны партызанскі аэрадром», зброю партызан, лістоўкі, сцягі, асабістыя рэчы, дакументы, узнагароды, фатаграфіі Шмырова і інш. партызан, маст. палотны «Заложнікі» А.Бяляўскага, «Сустрэча партызан з воінамі Савецкай Арміі» І.Стасевіча. У асобнай зале — рабочы пакой Шмырова. Побач з музеем бюст Шмырова работы З.Азгура, 2 артыл. гарматы і мінамёт, парк з алеяй дубоў, пасаджаных б. партызанамі, макет «Рэйкавая вайна». *Н.В.Сямешына.*

ШМЫРО́Ў Мінай Піліпавіч [партыз. псеўданім Бацька Мінай; 23.12.1891, в. Пунішча Віцебскага р-на — 3.9.1964], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху на Віцебшчыне ў Вял. Айч вайну, Герой Сав. Саюза (1944). З 1913 у арміі, з 1918 у Чырв. Арміі. Удзельнік 1-й сусв. і грамадз. войнаў (баёў супраць войск Краснова, Карнілава, Юдзеніча). У 1921—23 камандзір атрада па барацьбе з бандытызмам на Віцебшчыне, потым заг. гал. зямельнага аддзела, старшыня калгаса, дырэктар ільнозавода, кардоннай ф-кі. У пач. Вял. Айч. вайны 10 ліп. з рабочых ф-кі арганізаваў і ўзначаліў партыз. атрад, у крас.—кастр. 1942 камандзір 1-й Бел. партыз. брыгады. Акупанты, каб адпомсціць яму, узялі ў заложнікі 4 яго дзяцей і сваякоў і 14.2.1942 расстралялі іх. З ліст. 1942 у ЦШПР. Пасля вайны на сав. і гасп. рабоце. Чл. ЦВК БССР у 1935—38. Дэп. Вярх. Савета БССР у 1947—63. У Віцебску ўстаноўлены помнік, на радзіме і ў в. Пудаць Віцебскага р-на — абеліск; у Суражы — помнік загінуўшым дзецям Ш., у Віцебску — *Шмырова М.П. мемарыяльны музей*.

А.К.Шмыгун.

М.П.Шмыроў.

ШМЯЛЁЎ Іван Сяргеевіч (3.10.1873, Масква — 24.6.1950), рускі пісьменнік. Скончыў Маскоўскі ун-т (1898). З 1922 у эміграцыі. Друкаваўся з 1895. У аповесцях «Грамадзянін Уклейкін» (1908), «Чалавек з рэстарана» (1911), кн. апавяданняў «Да светлай мэты», «Яны і мы» (абедзве 1910) і інш. спачуванне «маленькаму чалавеку». Непрыняцце маральнага распаду, кровапраліцця ў выніку рэвалюцыі 1917 і прадчуванне гібелі Расіі ў кн. «Сонца мёртвых» (1923). У аўтабіягр. аповесцях «Лета Гасподняе; Святы—радасці—скрухі» (1933), «Багамолле» (1935), «Кулікова поле» (1947) настальгічныя карціны правасл. побыту і патрыярхальнага ладу. У рамане «Няня з Масквы» (1936) дарэв. і эмігранцкае жыццё вачыма простай рус. жанчыны. Аўтар казак, дарожных нарысаў.

Тв.: Собр. соч. [Т. 1—6]. М., 1998—99.

Літ.: Чумакевіч Э.В. Художественный мир И.С.Шмелева. Брест, 1999.

ШМЯРКО́ Уладзімір Пятровіч (н. 9.4.1949, г.п. Рось Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. вучоны ў галіне тэхн. кібернетыкі і інфарматыкі. Д-р тэхн. н. (1990), праф. (1991). Скончыў Мінскі радыётэхн. ін-т (1976), дзе і працаваў. З 1994 заг. кафедры Бел. эканам. ун-та. З 1996 у Шчэцінскім тэхн. ун-це (Польшча). Навук. працы па апрацоўцы сігналаў, лагічным праектаванні лічбавых прылад. Распрацаваў элементы тэорыі арыфм. логікі, паралельныя алгарытмы вылічэння лагічных функцый, эвалюц. алгарытмы сінтэзу лічбавых прылад.

Тв.: Алгоритмы и систолические процессоры для обработки многозначных данных. Мн., 1990 (разам з Г.А.Кухаравым, А.М.Зайцавай); Техника параллельной обработки бинарных данных на СБИС. Мн., 1991 (разам з Г.А.Кухаравым, С.М.Янушкевіч). *М.П.Савік.*

ШНЕЕРСО́Н Леў Міхайлавіч (26.12.1910, г. Чэлябінск, Расія — 1999), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (1963), праф. (1965). Скончыў Ленінградскі ін-т гісторыі, філасофіі, л-ры і лінгвістыкі (1934). У 1937—41, 1943—89 заг. кафедры новай і навейшай гісторыі БДУ. У 1941—43 нам. дырэктара Ніжнетагільскага настаўніцкага ін-та. Даследаваў гісторыю міжнар. адносін у Еўропе ў 2-й пал. 19 ст., навейшую гісторыю ЗША, Вялікабрытаніі, Турцыі, Ірана, англ. рабочага руху на мяжы 19—20 ст. Займаўся пытаннямі метадалогіі і замежнай гістарыяграфіі.

Тв.: Австро-прусская война 1866 г. и дипломатия великих европейских держав (из истории «германского вопроса»). Мн., 1962; В преддверии франко-прусской войны. Мн., 1969; Франко-прусская война и Россия: Из истории рус.-прус. и рус.-фр. отношений в 1867—1871 гг. Мн., 1976; На перепутье европейской политики: Австро-рус.-герман. отношения (1871—1875 гг.). Мн., 1984.

А.Г.Зельскі.

ШНЕЙДЭРМА́Н Марк Эмануілавіч (16.3.1898, г. Жытомір, Украіна — 15.6.1981), бел. дырыжор, кампазітар, педагог. Засл. дз. маст. Беларусі (1940). Скончыў Ленінградскую кансерваторыю (1930; кл. М.Малько, А.Гаўка). З 1935 (з перапынкамі) дырыжор Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. У 1947—57 маст. кіраўнік і гал. дырыжор сімф. аркестра Бел. філармоніі. Адначасова ў 1936—71 (з перапынкамі) выкладаў у Бел. кансерваторыі. На бел. сцэне пад яго муз. кіраўніцтвам пастаўлены опера «Міхась Падгорны» Я.Цікоцкага, балет «Салавей» М.Крошнера (абодва 1939) і інш. Аўтар музыкі для сімф. арк., у т.л. уверцюры (1939), п'ес для фп. з арк. (1953), для арк. бел. нар. інструментаў (1939), песень, балад, рамансаў, музыкі для дзяцей, апрацовак бел. нар. песень і інш. *Дз.М.Жураўлёў.*

ШНЕПЕРМА́Н Леў Барысавіч (н. 27.5.1930, г. Хмяльніцкі, Украіна), бел. матэматык. Канд. фіз.-матэм. н. (1963), праф. (1991). Скончыў Кіеўскі ун-т (1953). З 1965 у Бел. пед. ун-це імя М.Танка (у 1968—79, 1989—94 заг. кафедры). Навук. працы па паўгрупах неперарыўных пераўтварэнняў, тапалагічных і лінейных паўгрупах. Даказаў тэарэму дваістасці ў тэорыі камутатыўных

тапалагічных паўгруп. Рашыў праблему спалучанасці макс. лінейных дыскрэтных і кампактных інверсных паўгруп.

Тв.: К теории характеров локально бикомпактных топологических полугрупп // Математический сборник. 1968. Т. 77, № 4; Курс алгебры и теории чисел в задачах и упражнениях. Ч. 1—2. Мн., 1986—87; Аддитивная полугруппа линейных отношений // Докл. АН БССР. 1990. Т. 34, № 3.

Л.Г.Шнірэльман.

ШНІП Віктар Анатолевіч (н. 26.3.1960, в. Пугачы Валожынскага р-на Мінскай вобл.), бел. паэт. Вучыўся ў Мінскім архітэктурна-будаўнічым тэхнікуме (1975—78). Скончыў Вышэйшыя літ. курсы ў Маскве (1987). У 1980—85 супрацоўнічаў з час. «Неман» і газ. «Вячэрні Мінск». З 1987 у час. «Беларусь», з 1991 адказны сакратар газ. «Наша слова», з 1995 нам. гал. рэдактара — адказны сакратар, з 2002 гал. рэдактар штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва». Друкуецца з 1977. У зб-ках вершаў «Гронка святла» (1983), «Пошук радасці» (1987), «Шляхам ветру», «Горад-утопія» (абодва 1990), «На рэштках Храма» (1994), «Выкраданне Еўропы» (1996), «Чырвоны ліхтар» (2000), «Воўчы вецер» (2001), «Інквізіцыя» (2002), «Выратаванне атрутай» (2003) філас. роздум над лёсам Беларусі, духоўнымі праблемамі сучаснага грамадства, зварот да гіст. тэматыкі, тэма кахання. Піша для дзяцей: «Сунічкі для Веранічкі» (1995), «Наш Максім гаворыць: «Гу!» (1999). Аўтар «Сабачых гісторый» (з 2000). Некат. вершы Ш. пакладзены на музыку. *А.В.Спрынчан.*

ШНІРЭЛЬМА́Н Леў Генрыхавіч (15.1.1905, г. Гомель — 24.9.1938), савецкі матэматык. Чл.-кар. АН СССР (1933). Скончыў Маскоўскі ун-т (1925). З 1929 праф. Данскога політэхн. ін-та ў г. Новачаркаск. З 1934 у Матэм. ін-це АН СССР, адначасова з 1935 заг. кафедры Маскоўскага ун-та. Навук. працы па тэорыі лікаў, тапалогіі, варыяцыйным злічэнні. Развіў тапалагічныя метады варыяцыйнага злічэння (1927—29 з Л.А.Люстэрнікам), рашыў задачу А.Пуанкарэ аб трох геадэзічных (1929). Даказаў тэарэму аб расфарбоўцы n-мернай сферы ў $n + 1$ колераў (тэарэма Борсука—Улама—Ш.). Даказаў, што ўсялякі цэлы лік можа быць прадстаўлены ў выглядзе сумы абмежаванай колькасці простых лікаў (1930), чым даў першае прыбліжэнне да рашэння *Гольдбаха праблемы*.

Тв.: Топологические методы в вариационных задачах. М., 1930 (разам з Л.А.Люстэрнікам); Простые числа. М.; Л., 1940.

Літ.: Тихомиров В., Успенский В. Л.Г.Шнирельман // Квант. 1996. № 2. *М.М.Касцюковіч.*

ШНІ́ТКЕ Альфрэд Гарыевіч (24.11.1934, г. Энгельс Саратаўскай вобл., Расія — 3.8.1998), расійскі кампазітар. Засл. дз. маст. Расіі (1987). Чл.-кар. Каралеўскай швед. акадэміі музыкі (1987), шэрагу АМ Германіі. Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1958), у 1961—72 выкладаў у ёй. З 1990 жыў у Германіі, выкладаў у Гамбургскай кансерваторыі. У яго музыцы, прысвечанай тэмам жыцця і смерці, лёсам культуры і чалавецтва, традыц. муз. мова суіснуе з разнастайнай сучаснай кампазіцыйнай тэхнікай. Сярод твораў: оперы «Жыццё з ідыётам» (1991), «Джэзуальда» (1994); балеты «Эскізы» (паст. 1985), «Лабірынты», «Пер Гюнт» (абодва паст. 1989); сцэн. кампазіцыя «Жоўты гук» (паст. 1984); кантата «Гісторыя доктара Іагана Фауста» (1983); Рэквіем (1975); 9 сімфоній (1972—98), інстр. канцэрты (у жанры concerto grosso), канцэрты для інстр. з арк., у т.л. 2 для фп. (1960, 1979), 4 для скр. (1957—84), для габоя, арфы і стр. (1972), для віяланчэлі (1986) і для хору; кам.-інстр. ансамблі; музыка для драм. т-ра, кіно і тэлефільмаў (каля 60). Аўтар артыкулаў, у т.л. пра творчасць кампазітараў 20 ст. Дзярж. прэміі Расіі 1986, 1995.

Літ.: Холопова В.Н., Чигарева Е.И. А.Шнитке: Очерк жизни и творчества. М., 1990.

ШНІТКО́ Святаслаў Мікалаевіч (н. 14.7.1960, г.Віцебск), бел. вучоны ў галіне хірургіі. Д-р мед. н. (2003). Скончыў Самарскі мед. ін-т (1983), Ваенна-мед. Акадэмію імя Кірава (1992). З 1992 у Гал. ваен. клінічным шпіталі Мін-ва абароны Беларусі, з 1995 у Бел. мед. ун-це (з 2003 нач. ваенна-мед. ф-та). Навук. працы па таракальнай, відэатаракаскапічнай і ваенна-палявой хірургіі і інш.

Тв.: Эволюция хирургического лечения неспецифического спонтанного пневмоторакса (разам з У.А.Пландоўскім) // Новости хирургии. 1996. № 1; Восстановительные операции на трахее. М., 2001 (у сааўт.); Военно-полевая хирургия. Мн., 2001 (у сааўт.).

ШНІ́ЦЛЕР (Schnitzler) Артур (15.5.1862, Вена — 21.10. 1931), аўстрыйскі пісьменнік; прадстаўнік венскай школы мадэрну. Скончыў мед. ф-т Венскага ун-та (1885). Яго творчасць фарміравалася пад уплывам З.Фрэйда, рус. і франц. пісьменнікаў. Перавагу аддаваў праблемам кахання і смерці, канфлікту пачуцця з абавязкам. Аўтар аднаактовых п'ес «Анатоль» (1893), «Зялёны какаду» (1899), «Карагод» (1900), «Марыянеткі» (1906), камедыі «Прафесар Бернхардзі» (1912), аповесцей «Лейтэнант Густль» (1901), «Фрау Беата і яе сын» (1913), «Вяртанне Казановы» (1918), зб-каў навел «Жонка мудраца» (1898), «Маскі і цуды» (1912), «Сон і лёс» (1931) і інш. У яго творах з вытанчанай фабулай і рафінаванай атмасферай, адзначаных пільнай увагай да свядомасці і падсвядомасці персанажаў, крытыцызм у адлюстраванні грамадства часта ўраўнаважваецца сентыментальнасцю і эратызмам, імпрэсіянізм спалучаецца з рэаліст. тэндэнцыямі. У 1926 БДТ-1 паставіў яго п'есу «Зялёны какаду».

Тв.: Рус. пер. — Жена мудреца. М., 1967; Барышня Эльза. СПб., 1994.

Літ.: Проклов И.Н. Проза Артура Шницлера рубежа XIX—XX вв. и проблема литературного импрессионизма // Проблемы истории литературы. М.; Новополоцк, 2002. Вып. 15. *Е.А.Лявонава.*

ШНУР, даўняя бел. мера даўжыні і плошчы. Як адзінка даўжыні 1 Ш. = 75 *локцям* (48,7 м), як адзінка плошчы 1 Ш. = 100 кв. *прутам* (0,237 га).

ШНУРАВО́Й КЕРА́МІКІ КУЛЬТУ́РЫ, археалагічныя культуры плямён, якія ў 2-й пал. 3-га — 1-й пал. 2-га тыс. да н.э. насялялі тэр. ад Волгі да Ніжняга Рэйна, ад Паўд. Скандынавіі да вярхоўяў Эльбы і Днястра, у т.л. Сярэдняе Падняпроўе. Уяўляюць сабой культурна-гіст. агульнасць культур шнуравой керамікі — кубкаў, лодкападобных і баявых сякер, адзіночных пахаванняў і інш. Назву атрымалі ад характэрнага арнаменту ў выглядзе адбіткаў шнура на гліняным посудзе. У розны час Ш.к.к. даследавалі І.І.Арцёменка, М.Бухвальдак, П.Глоба, Дз.А.Крайноў, Х.А.Маора, Я.Махнік, І.К.Свешнікаў і інш. Насельніцтва Ш.к.к. займалася земляробствам і жывёлагадоўляй, жыло на невял. паселішчах па берагах рэк і азёр. Прамавугольныя жытлы мелі слупавую

Фрагменты гаршкоў **шнуравой керамікі культур** з паселішча Загорыны Мазырскага раёна Гомельскай вобл.

канструкцыю, існавалі наземныя ці крыху заглыбленыя, былі, відаць, і наземныя зрубныя пабудовы. Пахавальны абрад — трупапалажэнне на курганных і бескурганных могільніках. Іх кераміка прадстаўлена глінянымі пасудзінамі з высокімі цыліндрычнымі шыйкамі, S-падобным профілем, шарападобнымі амфарамі з кароткай шыйкай і 2 ручкамі-вушкамі (цюрынгскі тып). Посуд арнаментаваны адбіткамі шнура, наразнымі лініямі. Сярод прылад працы каменныя сякеры, крамянёвыя сякеры-кліны, наканечнікі стрэл, коп'яў, серпападобныя нажы, медныя і бронзавыя вырабы. Радзей трапляюцца касцяныя прылады і ўпрыгожанні. На тэр. Беларусі вылучаюць помнікі Ш.к.к.: *сяроднедняпроўскай культуры* (Верхняе Падняпроўе, Усх. Палессе), *шнуравой керамікі Палесся культуры* (Зах. Палессе), вісла-нёманскай культуры (Панямонне), *паўночнабеларускай культуры* (паўн. раёны). Са з'яўленнем на Беларусі Ш.к.к. (2-е тыс. да н.э.) пачалася эпоха бронзы, пашырыліся жывёлагадоўля і земляробства. На Пд Беларусі гэта адбылося, відаць, у пач. 2-га тыс. да н.э. Генетычная блізкасць Ш.к.к. дазваляе шукаць іх вытокі ў лесастэпавай зоне Правабярэжнай Украіны, паміж Дняпром і Віслай, Віслай і Рэйнам, на тэр. паўд.-ўсх. Еўропы. Арэал распаўсюджання Ш.к.к. амаль поўнасцю супадае з межамі рассялення ў больш позні час балтаў, германцаў, славян. Мяркуюць, што Ш.к.к. адыгралі важную ролю ў фарміраванні праславянскай, прабалцкай і прагерманскай культур. *М.М.Крывальцэвіч.*

ШНУРАВО́Й КЕРА́МІКІ ПАЛЕ́ССЯ КУЛЬТУ́РА, археалагічная культура плямён, якія каля 1800—1400 да н.э. жылі на З Бел. Палесся; адна са *шнуравой керамікі культур*. Даследавалі ў розны час У.Ф.Ісаенка, Ю.У.Кухарэнка. Насельніцтва займалася земляробствам і жывёлагадоўляй, жыло ў паселішчах на поплаўных узвышшах і першых надпоплаўных тэрасах. Жытлы — паўзямлянкі з агнішчамі. Пахавальны абрад — трупапалажэнне ў скурчаным становішчы на бескурганных могільніках. Кераміка гэтай культуры прадстаўлена гаршкамі з S-падобным профілем, патоўшчаным краем і вушкамі, кубкамі з косазрэзанымі краямі, амфарамі з разадзьмутым тулавам і вузкай цыліндрычнай шыйкай; іх днішчы шырокія і пляскатыя. Посуд выраблялі з гліны, у якую дамешвалі пясок ці шамот і загладжвалі пучком травы або саломы. Верхнія часткі посуду ўпрыгожвалі адбіткам шнура, «вусенькамі», лінейным штампам, наколамі, налепамі, «каўнерыкамі». Сярод прылад шліфаваныя крамянёвыя сякеры-кліны, сярпы, сэрца- і лістападобныя тронкавыя наканечнікі стрэл, коп'яў і дроцікаў, свідраваныя каменныя сякеры розных тыпаў (пераважна клінападобныя), матыкі, зерняцёркі і інш. Трапляюцца вырабы з бронзы і медзі. Большасць матэрыялаў выяўлена на помніках *Востраў, Камень, Моталь*, Уладычына, Церабень (Пінскі р-н Брэсцкай вобл.) і інш.

Літ.: Археалогія Беларусі. Т. 1. Мн., 1997.

М.М.Крывальцэвіч.

Крамянёвы кінжал **шнуравой керамікі Палесся культуры** з г. Маларыта Брэсцкай вобл.

ШНУРО́ЎКА, адна з лакальных назваў *гарсэта*.

ШНУРО́ЎКІ, у беларусаў від жаночага абутку. Найчасцей высокія (да палавіны лыткі) чаравікі на высокім або нізкім абцасе. Спераду або збоку шнураваліся тонкімі раменьчыкамі, каляровымі шнуркамі. Да 20 ст. святочны абутак дзяўчат і маладзіц.

ШО, возера ў Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Шоша (выцякае з возера), каля в. Надазер'е, за 32 км на У ад г. Глыбокае. Пл. 7,65 км^2, даўж. 4,2 км, найб. шыр. 2,1 км, найб. глыб. 3,1 м, даўж. берагавой лініі 12,4 км, пл. вадазбору 110 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу, круглаватая, выцягнутая з Пн на Пд. Схілы катлавіны выш. 2—4 м, пясчаныя, параслі лесам, часткова разараныя, на Пн і Пд забалочаныя. Берагі нізкія, пясчана-тарфяністыя, забалочаныя, пад лесам і хмызняком. Дно плоскае, сапрапелістае, уздоўж зах. і ўсх. берагоў да глыб. 0,5—1 м пясчанае. Зарастае па ўсёй плошчы разаком, рдзестамі, эладэяй, харавымі водарасцямі. Уздоўж берагоў паласа трыснягу і чароту шыр. да 30 м. Упадаюць ручаі з азёр Доўгае і Івесь.

ШОК (франц. choc штуршок, удар), агульная рэакцыя арганізма на дзеянне празмерных раздражняльнікаў. Характарызуецца глыбокім парушэннем функцыі нерв. рэгуляцыі, кровазвароту, дыхання, абмену рэчываў. Вылучаюць Ш. траўматычны, апёкавы, таксічны, посттрансфузійны (у выніку пераліванне крыві), інсулінавы, эл., псіхагенны і інш. Бывае лёгкі, сярэдні і цяжкі.

Адрозніваюць яго пачатковую (эрэктыльную) фазу (некалькі мінут) з узбуджэннем дыхання, кровазвароту, рухаў, маўлення, павышэннем артэрыяльнага ціску і інш. і тарпідную (ад некалькіх гадзін да сутак і больш) з тармажэннем нерв. сістэмы, прыгнечаннем рухальнай актыўнасці, зніжэннем т-ры цела, *гіпаксіяй*, парушэннем абменных працэсаў, функцыі нырак і інш. Лячэнне комплекснае. *І.М.Семяненя.*

ШО́КЛІ (Shocley) Уільям Брэдфард (13.2.1910, Лондан — 12.8.1989), амерыканскі фізік, адзін з вынаходнікаў паўправадніковых транзістараў. Чл. Нац. АН ЗША (1951). Скончыў Каліфарнійскі (1932) і Масачусецкі (1936) тэхнал. ін-ты. З 1936 у фірме «Белтэлефон лабаратарыс», з 1956 дырэктар Лабараторыі паўправаднікоў Шоклі, з 1958 прэзідэнт і дырэктар фірмы «Шоклі транзістар». З 1963 праф. Станфардскага ун-та. Навук. працы па фізіцы паўправаднікоў, ферамагнетызме, пластычнасці металаў, тэорыі дыслакацый. Прапанаваў правобраз паўправадніковага палявога транзістара (1939). Развіў



У.Б.Шоклі.

Шнуроўкі. Пач. 20 ст.

Возера **Шо**.

тэорыю *p-n*-пераходу (тэорыя Ш.), вынайшаў (1949) і стварыў (1951) першы плоскасны транзістар з *p-n*-пераходам, што дало пачатак транзістарнай электроніцы. Нобелеўская прэмія 1956 (з Дж.*Бардзінам* і У.*Братэйнам*, гл. Дадатак).

Тв.: Рус. пер. — Теория электронных полупроводников. Приложения к теории транзисторов. М., 1953. *М.М.Касцюковіч.*

Шолам-Алейхем.

М.А.Шолахаў.

ШО́ЛАМ-АЛЕ́ЙХЕМ (сапр. Рабінавіч Шолам Нохумавіч; 2.3.1859, г. Пераяслаў-Хмяльніцкі, Украіна — 13.5.1916), яўрэйскі пісьменнік. Вучыўся ў хедары і Пераяслаўскім рус. пав. вучылішчы. Друкаваўся з 1879. Пісаў на мовах ідыш і рускай. У раманах «Сэндэр Бланк і яго сямейка» (1887), «Стэмпеню» (1888), «Ёселе-салавей» (1889), «Патоп» (1907), «Блукаючыя зоркі» (1909—11), аўтабіягр. кн. «З кірмашу» (1916, няскончана), аповесцях, п'есах, цыклах апавяданняў, нарысах, сатыр. памфлетах крытыкаваў тагачасную рэчаіснасць, стварыў вобразы таленавітых людзей з народа, наследаваў дэмакр. і асветніцкія традыцыі рус. і еўрап. л-р. У 1908 і 1914 наведаў Беларусь. Падзеі, звязаныя з яго выступленнем у Баранавічах, знайшлі адлюстраванне ў апавяд. «Станцыя Баранавічы». На бел. мову яго творы пераклалі З.Бядуля, А.Васілевіч, Ю.Канэ, І.Саламевіч, Г.Шупенька. На бел. сцэне паводле твораў Ш.-А. пастаўлены п'есы «Свята ў Касрылаўцы» (1926), «200 000» (1944), «Блукаючыя зоркі» (1947; усе Дзярж. яўр. т-р БССР), «Тэўе-малочнік» (1939, яўр. т-р; 1963, Бел. т-р імя Я.Коласа), «Памінальная малітва» Р.Горына паводле Ш.-А. (1989, Бел. т-р імя Я.Купалы), «Грай, Ёселе, грай...» («Памінальная малітва») Горына паводле Ш.-А. (1991), «Хлопчык Мотл» (1998).

Тв.: Бел. пер. — Хлопчык Мотка. 4 выд. Мн., 1939; Запіскі коміваяжора. Мн., 1939; Дзіцячыя апавяданні. Мн., 1939; Апавяданні. Мн., 1940; Блукаючыя зоркі. Мн., 1998; Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—6. М., 1971—74.

Літ.: Ременик Г.А. Шолом-Алейхем: Критико-биогр. очерк. М., 1963; Фінкель У. Шолам-Алейхем. 2 выд. Мн., 1958.

ШО́ЛАХАЎ Міхаіл Аляксандравіч (24.5.1905, хутар Кружылін, Вёшанскі р-н Растоўскай вобл., Расія — 21.2.1984), рускі пісьменнік. Акад. АН СССР (1939). Двойчы Герой Сац. Працы (1967, 1980). Вучыўся ў гімназіі (1913—18). З 1926 жыў у станіцы Вёшанскай. Друкаваўся з 1923. Першыя зб-кі «Данскія апавяданні» і «Блакітны стан» (абодва 1926) пра грамадз. вайну на Доне. У рамане «Ціхі Дон» (кн. 1—2, 1928; кн. 3, 1929—32; кн. 4, 1937—40; Дзярж. прэмія СССР 1941; экранізацыі 1930, 1957—58) драм. лёс данскога казацтва ў гады 1-й сусв. і грамадз. вайнаў, праблема народа і асобы ў рэвалюцыі. У рамане «Узнятая цаліна» (кн. 1—2, 1932—60; Ленінская прэмія 1960; экранізацыі 1940; серыі 1—3, 1960—61) паказ калектывізацыі адзначаны зададзенасцю ідэалагічных установак. У Вял. Айч. вайну карэспандэнт газ. «Правда», выступаў з нарысамі, публіцыст. артыкуламі, апавяданнямі («Навука нянавісці», 1942, і інш.). Падзеям Вял. Айч. вайны прысвечаны раздзелы рамана «Яны змагаліся за Радзіму» (няскончаны; асобныя главы 1943—44, новы варыянт 1969; экранізацыя 1975). Апавяд. «Лёс чалавека» (1956—57; экранізацыя 1959) пра суровыя выпрабаванні, сілу і нязломнасць духу чалавека. Публіцыстычныя артыкулы і выступленні склалі кн. «Па наказе душы» (1970).

Блізкія і сугучныя творам Ш. аповесці «Адшчапенец» Я.Коласа і «Вясна» К.Чорнага, раманы «Вязьмо» М.Зарэцкага, «Язэп Крушынскі» З.Бядулі, у якіх узнаўляецца жыццё народа ў пераломныя моманты яго гісторыі. Творы Ш. паўплывалі і на творчасць І.Мележа, В.Быкава, І.Чыгрынава, В.Адамчыка і інш. На бел. мову перакладзены «Узнятая цаліна» (1934), «Ціхі Дон» (кн. 1—3, 1936, пер. У.Хадыка), «Лёс чалавека» (1959, пер. Я.Шарахоўскі), «Яны змагаліся за Радзіму» (1975, раздзелы з рамана, пер. М.Лужанін) і інш. На Беларусі інсцэніравана «Узнятая цаліна» (1934, 1963, 1981, Дзярж. рус. драм. т-р Беларусі; 1975, Магілёўскі абл. т-р драмы і камедыі) і «Нахабнічак» (1980, Бел. рэсп. т-р юнага гледача). Нобелеўская прэмія 1965.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—8. М., 1980.

Літ.: Хватов А.И. Художественный мир Шолохова. М., 1978; Мировое значение творчества Михаила Шолохова. М., 1976; Бирюков Ф.Г. Художественные открытия Михаила Шолохова. М., 1980; Литвинов В. Михаил Шолохов. 3 изд. М., 1985.

П.К.Дзюбайла.

ШОЛК Уладзімір Ісакавіч (н. 12.7.1941, г. Луганск, Украіна), бел. мастак кнігі. Скончыў арх. ф-т БПІ (1972). Працаваў у Львоўскім маст.-рэкламным камбінаце, у бел. філіяле Усесаюзнага НДІ тэхн. эстэтыкі, з 1981 у выд-вах «Вышэйшая школа» і «Інтэрдайджэст», з 1993 дырэктар выд-ва «Арт Дызайн». У творчасці імкнецца да канструкцыйнай завершанасці кнігі і гарманічнага адзінства ўсіх яе элементаў, высокай культуры тыпаграфікі. Афарміў кнігі: «Жывапіс Беларусі XIX — пачатку XX ст.» (1974) і «Жывапіс Савецкай Беларусі» (1979) Л.Дробава, «Беларускі савецкі жывапіс» (1978), «І.Р.Лангбард» (1976) і «Жыллёвае будаўніцтва ў Беларускай ССР» (1980) А.Воінава, «Гісторыя архітэктуры народнага жылля Беларусі» У.Трацэўскага (1989), «Кентаўр...» Э.Сакалова (1982), «Адкуль ёсць пайшоў буквар» М.Батвінніка (1983), «Гісторыя пісьма» М.Паўленкі (2-е выд. 1987), «Францыск Скарына — беларускі гуманіст, асветнік, першадрукар» (1989), «Старажытная Беларусь» М.Ермаловіча (1990), «Дарогі роднай Беларусі», «Добры дзень, Беларусь!» Г.Ліхтаровіча (абедзве 2000), «АСБ «Беларусбанк» (2002), «Мінская кальцавая аўтамабільная дарога» (2003) і інш. *Л.А.Палішчук.*



У.Шолк. Фрагменты мастацкага афармлення кнігі «Францыск Скарына — беларускі гуманіст, асветнік, першадрукар». 1989.

ШОЛЬЦ (Scholz) Фрыдрых (н. 1.3.1928, г. Гамбург, Германія), нямецкі славіст. Д-р філал. н. (1953), д-р габілітаваны (1959). Правадз. чл. Рэйн-Вестфальскай АН (Дзюсельдорф, 1983), чл.-кар. Латв. АН (1992). Скончыў Гамбургскі ун-т (1952), з 1959 працаваў у ім. З 1962 праф. Майнцкага ун-та, Ін-та замежных моў і перакладу, з 1966 — Мюнстэрскага ун-та, дырэктар Славяна-балт. семінара, з 1993 дырэктар Міждысцыплінарнага ін-та вывучэння Балтыкі Мюнстэрскага ун-та. Даследуе стараж. і сучасную бел. л-ру («Эцюды аб малітвах Кірылы Тураўскага», 1987; «Беларуская паэзія і еўрапейскі мадэрнізм», 1998), творчасць М.Багдановіча («Максім Багдановіч і сучасная літаратура: Да гісторыі мадэрнізму ў беларускай літаратуры», 1991), бел. фальклор («Літоўская і беларуская народныя песні», 1984). Аўтар манаграфій «Славянская этымалогія» (1966), «Літаратуры Балтыкі: Іх узнікненне і развіццё» (1990), сааўтар выдавецкага праекта «Матэрыялы па гісторыі славістыкі ў Германіі» (ч. 2, 1987). Арганізатар 1-га ў Зах. Еўропе Міжнар. сімпозіума «Беларусь і Захад» (1990),

рэдактар і выдавец яго матэрыялаў у аднайм. зборніку (1998). *У.Л.Сакалоўскі.*

ШО́НБАЙН (Schönbein) Крысціян Фрыдрых (18.10.1799, Метцынген, зараз зямля Бадэн-Вюртэмберг, Германія — 29.8.1868), нямецкі хімік. Вучыўся ў Цюбінгенскім і Эрлангенскім ун-тах (1819—22). Працаваў у Швейцарыі, з 1828 праф. Базельскага ун-та. Адкрыў *азон* (1840). Атрымаў калодый (1846), нітрацэлюлозу (1846) і вывучыў яе ўласцівасці. Даследаваў каталітычныя рэакцыі раскладання і акіслення, некат. прыродныя працэсы — *браджэнне, гніенне.*

ШО́НБЕРГ (Schönberg) Арнольд (13.9.1874, Вена — 13.7.1951), аўстрыйскі кампазітар, муз. тэарэтык і педагог; кіраўнік *новай венскай школы*, заснавальнік *дадэкафоніі*. З 1925 праф. Прускай АМ у Берліне. З 1933 у ЗША, у 1936—44 праф. Каліфарнійскага ун-та. Творчасць Ш. паўплывала на муз. мастацтва 20 ст.; распрацаваны ім дадэкафонны метад стымуляваў развіццё муз. серыялізму (гл. *Серыйная тэхніка, Серыяльнасць*). Сярод твораў: оперы «Шчаслівая рука» (паст. 1913), «З сёння на заўтра» (паст. 1930), «Майсей і Арон» (1932, нясканчаная, паст. 1954); араторыі, кантаты, у т.л. «Песні Гурэ» (1911), «Уцалелы з Варшавы» (1947); цыкл меладрам для голасу з інстр. ансамблем «Месячны П'еро» (1912), сімф. паэма «Пелеас і Мелізанда» (1903), 2 камерныя сімфоніі (1906, 1939), інстр. канцэрты, 4 стр. квартэты (1905—36), стр. секстэт «Прасветленая ноч» (1899), вак. творы, хары. Аўтар муз.-тэарэт. прац («Вучэнне аб гармоніі», 1911) і крытычных артыкулаў. Сярод вучняў А.*Берг*, А.*Веберн*, Г.Э.Апостэль, Э.Велес, Г.Д.Каўэл, Г.Эйслер.

Літ.: Соллертинский И.И. А.Шенберг. Л., 1934; Павлишин С. Творчество А.Шенберга, 1899—1908 гг. // Музыка и современность. М., 1969. Вып. 6; Кон Ю. Шенберг // Музыка XX в. М., 1984. Ч. 2, кн. 4.

ШО́НБЕРГ (Shoenberg) Ісак Юльевіч (1.3.1880, г. Пінск Брэсцкай вобл. — 25.1.1963), англійскі інжынер-электрык і вынаходнік. Чл. Ін-та інжынераў-электрыкаў (1920). Скончыў Кіеўскі політэхн. ін-т (1904). З 1905 гал. інжынер Рус. т-ва бяздротавых тэлеграфаў і тэлефонаў. З 1914 у Вялікабрытаніі, нач. патэнтнага аддзела кампаніі «Марконі». З 1928 у кампаніі «Каламбія графафон», з 1931 у фірме «Электрык энд мюзікал індастрыс» (з 1955 дырэктар). Займаўся распрацоўкай і пабудовай першых радыёстанцый у Расіі. У пач. 1930-х г. вынайшаў перадавальную тэлевізійную трубку — эмітрон, разам з інш. распрацаваў суперэмітрон, з дапамогай якога ўпершыню ў Вялікабрытаніі ажыццёўлена пазастудыйная тэлеперадача (1937). Пад яго кіраўніцтвам распрацавана першая сістэма электроннага тэлебачання высокага распазнавання (1934). Медаль М.Фарадэя (1954).

Літ.: Sir Isaac Shoenberg // Wireless World. 1963. Vol. 69. March. P. 119; Левин Р. Сэр Исаак Шонберг... из России // Радио. 1991. № 8. *М.М.Касцюковіч.*

ШО́НГАЎЭР (Schongauer), Шон (Schön) Марцін (паміж 1435 і 1440, г. Кальмар, Францыя — 2.2.1491), нямецкі графік і жывапісец. Вучыўся ў Нідэрландах, дзе зазнаў моцны ўплыў Рагіра ван дэр *Вэйдэна*. Працаваў у Кальмары,

М.**Шонгаўэр**. Мадонна ў альтанцы з ружаў. 1473.

М.**Шонгаўэр**. Святая сям'я.

з 1483 у Брэйзаху. Жывапісныя творы («Мадонна ў альтанцы з ружаў», 1473) і асабліва гравюры на медзі («Спакушэнне св. Антонія», серыя «Страсці Хрыстовы») вызначаюцца эмацыянальнай вастрынёй і павышанай экспрэсіўнасцю, часам імкненнем да гарманічнай яснасці кампазіцыі. Творчасць Ш., якая спалучае рысы позняй готыкі і Ранняга Адраджэння, моцна паўплывала на ням. майстроў 2-й пал. 15—16 ст. (А.*Дзюрэр* і інш.).

ШО́ПКА (польск. szopka літар. — вяртэп), адна з форм польскага нар. т-ра лялек. Вядома з 16 ст., пашырана ў 17—20 ст. Узнікненне звязана са святам Каляд. Уяўляла сабой 2-ярусную скрынку. Лялечнікі вадзілі драўляныя лялькі на шпянях па праразях у падлозе сцэны-яруса. На верхнім ярусе («рай») паказвалі сцэны на біблейскія сюжэты, на ніжнім («пекла») — інтэрмедыі (кароткія камічныя сцэнкі з песнямі і танцамі). Сярод папулярных персанажаў інтэрмедый польскі аналаг Пятрушкі — Капленяк. Паказы Ш. паўплывалі на зараджэнне ў 16—17 ст. лялечных спектакляў на Беларусі (*батлейка*) і на Украіне (*вяртэп*).

ШО́ПРАН (Sopron), горад на ПнЗ Венгрыі. Узнік на месцы стараж.-рым. паселішча Скарбанцыя. 55 тыс. ж. (1991). Прам-сць: тэкст., трыкат., швейная, металаапрацоўчая, харчовая. Цэнтр раёна вінаградарства і вінаробства. Арх. помнікі: гатычны касцёл (13—15 ст.), касцёлы св. Міхаіла (13—15 ст.) і св. Георгія (14—18 ст.), кляштар бенедыкцінцаў (14 ст.), гар. вежа (17 ст.). Музей імя Ф.*Ліста*.

ШОП-ТУР (ад англ. shop магазін + tour паездка, падарожжа), паездка за мяжу з мэтай набыцця рэчаў, прадуктаў і да т.п. Адрозніваецца ад бізнес-тура — паездкі з камерцыйнымі мэтамі.

ШО́РАХ Рыгор Паўлавіч (н. 3.3.1930, в. Налезнікі Жабінкаўскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне хірургіі. Д-р мед. н. (1976), праф. (1980). Засл. дз. нав. Беларусі (1998). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1954), дзе і працаваў з 1960 (з 1976 заг. кафедры). З 1980 у Бел. мед. акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Навук. працы па хірург. лячэнні вострага халецыстыту і захворванняў жоўцевых шляхоў, ускладненняў язвавай хваробы страўніка і дванаццаціперснай кішкі.

Тв.: Лазеры: плазменный скальпель в неотложной абдоминальной хирургии. Мн., 1993 (разам з І.Г.Ляндрэсам, П.М.Назаранкам); Острый холецистит. Мн., 1997 (разам з М.В.Завадай); Язвенные гастродуоденальные кровотечения. Мн., 1998 (разам з У.У.Клімовічам).

ШОРТ-ТРЭК (англ. short track кароткая дарожка), від канькабежнага спорту; гл. ў арт. *Скорасны бег на каньках.*

ШО́СТАК Аляксандр Канстанцінавіч (н. 19.8.1949, в. Церхавішчы Лагойскага р-на Мінскай вобл.), бел. мастак-ювелір. Скончыў Гомельскі ун-т (1972). У 1989—92 і з 2000 на Мінскім маст. камбінаце, у 1992—95 гал. мастак прадпрыемства «Геатрон». Сярод твораў камплекты ўпрыгожанняў «Спадчына» (1974), «Ручнікі» (1976), «Прыпяцкія пералівы», «Зімовы вечар» (абодва 1978), «Веснавыя матывы» (1980), «Скань» (1986), «Залатая восень», «Бурштынавае Палессе» (абодва 1988), «Вячэрні», «Асенні сон», «Расінка», «Ружа вятроў» (усе 1999), «Нефрыт», «Паўмесяц», «Вікторыя» (усе 2000), «Прынцэса», «Палессе», «Зіма» (усе 2001), «Мудрасць» (2002), «Бэзавы туман», «Вясна», «Удача» (усе 2003), пярсцёнкі, бранзалеты, завушніцы, брошкі і інш.

Л.Ф.Салавей.

А.Шостак. Кальe «Ружа вятроў». 1999.

ШО́СТАК Леанід Уладзіміравіч (16.2.1922, хутар Вікторына, Лагойскі р-н Мінскай вобл. — 1993), бел. разьбяр па дрэве. З 1966 майстар-надомнік Маладзечанскай ф-кі маст. вырабаў. Яго творы вызначаліся мяккай прапрацоўкай матэрыялу, спалучэннем гладкіх форм з графічнай прарэзкай: «Калгасніца», «Аўрора», «Таня-падрыўніца» (усе 1960), «Ільнавод» (1962), «Юнацтва» (1963), «Першая літара», «Мара», «Беларускі шоўк» (усе 1964) і інш. Выкарыстоўваў таксама точаны посуд, сувеніры.

А.К.Лявонава.

ШО́СТКА Валянціна Міхайлаўна (27.11.1924, в. Ярыгава Ленінградскай вобл.— 30.10.1984), бел. вучоны ў галіне гематалогіі дзіцячага ўзросту. Д-р мед. н. (1976). Скончыла Мінскі мед. ін-т (1947), дзе і працавала з 1958. З 1970 у НДІ аховы мацярынства і дзяцінства. Навук. працы па дыягностыцы і лячэнні вострага лейкозу і сепсісу ў дзяцей.

Тв.: Диагностика и дифференцированная терапия острого лейкоза у детей. Мн., 1979 (разам з Л.С.Налімавай); Диагностика бактериального типа сепсиса у новорожденных детей // Проблемы ранней послеродовой адаптации новорожденного ребенка. Мн., 1981.

ШО́СТРЭМ (Sjöström) Віктар Давід (20.9.1879, г. Сільбадаль, Швецыя — 3.1.1960), шведскі кінарэжысёр, акцёр. У 1896—1911 іграў у т-рах Швецыі і Фінляндыі (у 1898 рэжысёр Швед. т-ра ў Хельсінкі). З 1912 у кіно. Раннія фільмы блізкія да меладрамы; у іх цікавасць да сац. праблем, жыцця гар. беднаты («Забастоўка», 1913; «Дзеці вуліцы», 1914, і інш.). Эпічная насычанасць вобразаў, яркія характары герояў, наватарскі мантаж зрабілі Ш. заснавальнікам т. зв. швед. класічнай кінашколы. Новы стыль распрацоўваў у фільмах «Тэр'е Віген» (1916), «Горны Эйвінд і яго жонка» (1917), «Сыны Інгмара» (1918), «Вознік» (1920) і інш., у якіх выступаў як рэжысёр і акцёр. З 1923 у Галівудзе, дзе паставіў 9 фільмаў, у т.л. «Вецер» (1928). У 1930 вярнуўся на радзіму і стварыў адзін з першых гукавых швед. фільмаў «Маркурэлы з Вадчэпінга». Паставіў таксама гіст. драму «Пад чырвонай мантыяй» (1937), зняўся ў фільме «Сунічная паляна» (1957).

ШО́СТЫ З'ЕЗД КП(б)Б [XI канферэнцыя КП(б)Б]. Адбыўся 15—19.3.1922 у Мінску. Прысутнічала 100 дэлегатаў з рашаючым і 48 з дарадчым голасам ад 5150 чл. і канд. у чл. партыі (разам з вайсковымі арг-цыямі). Парадак дня: справаздачы ЦК (В.Г.Кнорын), Рэвіз. камісіі КП(б)Б (? Чарноў), Кантрольнай камісіі КП(б)Б (Я.Б.Быкін); даклады з месцаў; аб тактыцы Камінтэрна (М.А.Сямашка); аб парт. буд-ве (Кнорын); аб рабоце КСМ (В.А.Багуцкі); аб рабоце прафсаюзаў (В.А.Нодэль); аб фін. палітыцы (А.Р.Чарвякоў); аб с.-г. кампаніі (А.С.Славінскі); выбары. З'езд адзначаў, што ЦК з улікам мясц. асаблівасцей праводзіла агульную лінію ЦК РКП(б) «як непарыўнай састаўной часткі нашай Расійскай Савецкай Федэрацыі». З гэтага вынікала, што кіраўніцтва КП(б)Б не лічыла *Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку Беларусі* самастойнай дзяржавай. Значная ўвага на з'ездзе аддавалася пытанням парт. будаўніцтва. Больш жорсткімі станавіліся ўмовы прыёму ў партыю. Каб адгароджвацца ад наплыву дробнабурж. элементаў, ад парт. к-таў патрабавалася «сур'ёзнае вывучэнне сацыяльнага паходжання, усяго мінулага жыцця і рэвалюцыйнай работы кожнага, хто ўступае ў рады партыі». Кандыдацкі стаж павялічаны да 1 года. Для ўступлення ў партыю патрэбны былі рэкамендацыі не менш як 3 камуністаў, якія мелі парт. стаж не менш за 3 гады. У галіне агітац.-прапагандысцкай работы з'езд даручыў ЦК стварыць папулярную сял. газету «на зразумелай для шырокіх мас вёскі мове», наладзіць выданне невял. папулярных брашур. Гэта была яўная падтрымка палітыкі *беларусізацыі*, хаця такі тэрмін у дакументах з'езда адсутнічаў. У рэзалюцыі «Аб рабоце КСМ» гаварылася, што ва ўмовах нэпа камсамол як класавая арг-цыя рабочай і сял. моладзі павінен рыхтаваць рэзервы для партыі і служыць правадніком камуніст. ідэй сярод шырокіх пластоў падрастаючага пакалення. З'езд падкрэсліў, што ва ўсіх прафс. органах павінны стварацца пастаянна дзеючыя камуніст. фракцыі, «якія папярэдне абмяркоўваюць і вырашаюць усе пытанні саюзнай дзейнасці». Фракцыя з'яўлялася органам пастаяннага нагляду і кантролю за дзейнасцю пэўнай прафс. арг-цыі. З'езд выбраў ЦК КП(б) з 13 чл. і 4 канд. у чл., Кантрольную камісію КП(б)Б з 3 чл. і 2 канд. у чл., Рэвіз. камісію КП(б)Б з 3 чл. і 2 канд. у чл., 4 дэлегаты з рашаючым і 2 з дарадчым голасам на XI з'езд РКП(б).

Літ.: XI конференция Коммунистической партии Белоруссии (15—19 марта 1923 г.): (Стеногр. отчет). Мн., 1922; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 1. 1918—1927. Мн., 1983.

В.Ф.Кушнер.

ШО́СТЫ УСЕБЕЛАРУ́СКІ З'ЕЗД САВЕ́ТАЎ (надзвычайны) рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Адбыўся 13—16.3.1924 у Мінску. Прысутнічала 249 дэлегатаў з рашаючым і 156 з дарадчым голасам. Парадак дня: міжнар. і ўнутр. становішча СССР (М.І.Калінін); расшырэнне межаў БССР і задачы сав. будаўніцтва (А.Р.Чарвякоў); адм.-гасп. падзел БССР (А.І.Адамовіч); заснаванне Бел. с.-г. банка (Н.Л.Аксючыц); пытанні Канстытуцыі БССР (А.Х.Гетнер); выбары ЦВК БССР (В.А.Багуцкі). З'езд сабраўся ў надзвычайным парадку для вызначэння шляхоў развіцця рэспублікі пасля 1-га *ўзбуйнення БССР*. Меў важнае прапагандысцкае міжнар. значэнне і павінен быў, паводле слоў Чарвякова, прадэманстраваць, «якім чынам ва ўмовах Савецкай дзяржавы вырашаюцца пытанні, невырашальныя ва ўмовах буржуазнай дзяржавы». З'езд намеціў чарговыя задачы: правядзенне па ўсёй тэр. БССР адзінага закона аб землекарыстанні, павышэнне прадукцыйнасці працы ў сельскай гаспадарцы, ліквідацыя непісьменнасці дарослага насельніцтва і інш. Разгледжана пытанне аб новым адм. падзеле БССР, даручана ЦВК рэспублікі ажыццявіць раянаванне не пазней пачатку новага бюджэтнага года (1.10.1924). З'езд даручыў ЦВК унесці на разгляд *Сёмага Усебеларускага з'езда Саветаў* праект новай Канстытуцыі БССР, змяніў некат. канстытуцыйныя нормы, у прыватнасці, адмяніў сумяшчэнне ў адной асобе пасад старшынь

ЦВК і СНК БССР, устанавіў склад Прэзідыума ЦВК БССР з 9 чал. Прыняў пастановы «Аб беларускім сельскагаспадарчым банку», «Аб амністыі», «Аб увекавечанні памяці У.І.Леніна». З'езд выбраў ЦВК БССР з 120 чл. і 30 кандыдатаў.

Літ.: VI Всебелорусский чрезвычайный съезд Советов рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов: Стеногр. отчет. Мн., 1924. *І.Г.Яцкевіч.*

ШОТ Аляксандр Уладзіміравіч (н. 13.3.1925, в. Дзямідавічы Дзяржынскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне хірургіі. Засл. дз. нав. Беларусі (1977). Д-р мед. н. (1964), праф. (1967). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1953), дзе і працуе (у 1965—92 заг. кафедры). Навук. працы па абдамінальнай хірургіі, транспланталогіі, ангіягенным сепсісе. Распрацаваў і ўкараніў у практыку пратэзаванне клапанаў аорты без выключэння сэрца з кровазвароту. Дзярж. прэмія Беларусі (1988).

Тв.: Кишечный шов. Мн., 1983 (разам з А.А.Запарожцам, В.Ю.Клінчэвічам); Необычная реакция на чужеродные ткани. Ч. 1—2. Мн., 1992 (у сааўт.); Патогенез, диагностика и лечение ангиогенного сепсиса. Гомель, 2002 (разам з З.А.Дундаравым).

ШОТ (Schott) Фрыдрых Ота (17.12.1851, г. Рур, Германія — 27.8.1935), нямецкі хімік, заснавальнік і кіраўнік Іенскай шкляной вытв-сці. Вучыўся ў Вышэйшай тэхн. школе ў Ахене, у Вюрцбургскім і Лейпцыгскім ун-тах. Навук. працы па хіміі і тэхналогіі шкла. Увядзеннем у састаў шкла разнастайных аксідаў (берылію, цынку, свінцу), борнага і фосфарнага ангідрыдаў стварыў гатункі шкла з асабліва каштоўнымі якасцямі — аптычнымі, хім., тэрмічнымі, электрычнымі і інш. Арганізаваў вытв-сць высакаякасных шкляных, хім., мед., электратэхн. прылад і апаратуры.

ШО́ТКІ ДЫЁД, *паўправадніковы дыёд*, дзеянне якога заснавана на выкарыстанні ўласцівасці кантакту метал — паўправаднік выпрамляць пераменны эл. ток з прычыны наяўнасці несім. энергет. бар'ера для руху электронаў (*дзірак*) паміж рознымі праваднікамі электрычнасці.

Асновы тэорыі Ш.д. створаны ням. вучоным В.Шоткі ў канцы 1930-х г. Сіла току праз Ш.д., як і праз *электронна-дзірачны пераход*, залежыць ад напрамку эл. поля паміж металам і паўправадніком, створанага знешняй крыніцай. Пры інш. роўных умовах Ш.д. выпрамляе ток больш высокай частаты, чым паўправадніковы дыёд з *p-n*-пераходам. Выраблюць Ш.д. напыленнем ці (электра)хімічным асаджэннем на паверхню паўправадніка (крэмнію, арсеніду галію, германію) тонкага слоя металу (алюмінію, малібдэну, золата). Выкарыстоўваюцца для вырабу выпрамнікоў (пераключальнікаў) токаў звышвысокіх частот, фотадыёдаў, транзістараў.

Літ.: Гл. пры арт. *Паўправадніковыя прылады.* *М.А.Паклонскі.*

ШО́ТКІ ЭФЕ́КТ, павелічэнне шчыльнасці току насычэння *тэрмаэлектроннай эмісіі* пры павелічэнні напружанасці знешняга эл. поля, накіраванага ад *анода* да *катода*.

Тэорыя Ш.э. для металаў створана ням. вучоным В.Шоткі (1914). Пры адсутнасці знешняга эл. поля залежнасць патэнцыяльнай энергіі электрона ў вакууме ад адлегласці да паверхні метал. катода мае форму *гіпербалы* (а не прамавугольнай ступенькі). Гэта абумоўлена сіламі электрастатычнага прыцяжэння (сіламі люстранога відарыса): электрон, які знаходзіцца ў вакууме на адлегласці x_c ад катода, узаемадзейнічае з ім так, быццам у катодзе на адлегласці x_c ад яго паверхні знаходзіцца засяроджаны дадатны зарад, роўны па модулі зараду электрона. Пры стварэнні знешняй крыніцай рознасці эл. патэнцыялаў паміж катодам і анодам *работа выхаду* электронаў з металу ў вакуум памяншаецца. Ш.э. праяўляецца пры працяканні току праз кантакт метал-паўправаднік (*Шоткі дыёд*). На аснове Ш.э. даследуюцца ўласцівасці паверхні катода.

Літ.: Модинос А. Авто-, термо- и вторично-электронная эмиссионная спектроскопия: Пер. с англ. М., 1990. *М.А.Паклонскі.*

ШО́У (англ. show), 1) сцэнічнае відовішча забаўляльна-эстраднага жанру з удзелам майстроў эстрады, цырка, кіно і інш. Арганізацыю і правядзенне такіх прадстаўленняў наз. шоу-бізнесам (відовішчная камерцыйная дзейнасць, якая пашырылася ў канцы 20 ст.). 2) У пераносным сэнсе — што-н. паказное, разлічанае на шумны знешні эфект, на прыцягненне да сябе ўвагі (напр., паліт. Ш.).

ШО́У (Shaw) Джордж Бернард (26.7.1856, Дублін — 2.11.1950), англійскі пісьменнік; адзін з найбуйнейшых прадстаўнікоў «новай драмы», рэфарматар тэатр. мастацтва. Служыў клеркам, з 1876 у Лондане, займаўся журналістыкай, быў маст. рэцэнзентам, муз. аглядальнікам, тэатр. крытыкам. Цікавіўся сацыялісты. ідэямі, адзін з заснавальнікаў *«Фабіянскага таварыства»*. На яго творчасць паўплывалі Г.Ібсен і рус. пісьменнікі. Дэбютаваў як раманіст: «Нясталасць» (1879, выд. 1930), «Неразумны шлюб» (1880), «Прафесія Кэшэля Байрана» (1882) і інш. Сусв. вядомасць яму прынеслі камедыі і сац.-псіхал. драмы; сярод апошніх вял. месца займаюць т.зв. драмы ідэй, п'есы-дыскусіі. Стварыў цыклы «П'есы прыемныя» («Дамы ўдаўца», паст. 1892; «Сэрцаед», «Прафесія місіс Уорэн», абедзве паст. 1905), «П'есы прыемныя» («Зброя і чалавек», паст. 1894; «Кандыда», «Выбраннік лёсу», абедзве паст. 1897; «Пажывём — пабачым!», паст. 1899), «П'есы для пурытан» («Вучань д'ябла», паст. 1897; «Ператварэнне капітана Брасбаўнда», паст. 1900; «Цэзар і Клеапатра», паст. 1901). П'есы «Другі вастраў Джона Буля» (паст. 1904), «Маёр Барбара» (паст. 1905) — сатыра на паліт. жыццё Англіі. Драма «Дом, дзе разбіваюцца сэрцы» (паст. 1920), пенталогія «Назад да Мафусаіла» (паст. 1922), трагедыя «Святая Іаанна» (паст. 1923) напоўнены драматызмам і філас. роздумам. Аўтар камедый «Пігмаліён» (паст. 1913), «Каляска з яблыкамі» (паст. 1929), «Дрэнна, ды праўда» (паст. 1932), «Мільянерка» (паст. 1936), тэарэт. і публіцыстычных прац і інш. Яго творы адметныя значнасцю сац.-паліт. і маральна-этычнай праблематыкі, філас. глыбінёй, вастрынёй канфлікту, багаццем маст. палітры, у якой гратэск, іронія, парадокс, выразны публіцыстычны пачатак спалучаюцца з інтэлектуалізмам, умоўнасцю, падтэкстам. На бел. сцэне паводле аднайм. п'ес Ш. пастаўлены спектаклі «Вучань д'ябла» (1922, БДТ; 1960), «Пігмаліён» (1940, Дзярж. польскі т-р БССР; 1944, Дзярж. яўр. т-р БССР; 1953, Дзярж. рус. драм. т-р Беларусі; 1964), «Лонданскія трушчобы» (1951), «Мая цудоўная лэдзі» Ф.Лоу паводле п'есы «Пігмаліён» (1982, Дзярж. т-р муз. камедыі Беларусі), «Прасцячкі нечаканых астравоў» паводле твораў Ш. (1991, рус. драм. т-р), «Мільянерка» (1995), «Лялька» паводле п'есы «Пігмаліён» (1999). Нобелеўская прэмія 1925.



Дж.Б.Шоу.

Тв.: Рус. пер. — Полн. собр. пьес. Т. 1—6. Л., 1978—80; О драме и театре. М., 1963; Письма. М., 1971; Автобиографические заметки. Статьи. Письма. М., 1989.

Літ.: Ромм А.С. Джордж Бернард Шоу, 1856—1950. Л.; М., 1965; Яеж. Шоу-теоретик. Л., 1972; Образцова А.Г. Бернард Шоу и европейская театральная культура на рубеже XIX—XX вв. М., 1974; Деннинг-хаус Ф. Театральное призвание Бернарда Шоу: Пер. с нем. М., 1978; Балашов П. Художественный мир Бернарда Шоу. М., 1982; Бернард Шоу: Биобиблиогр. указ. к 100-летию со дня рождения. М., 1956.

Е.А.Лявонава.



Да арт. **Шоткі эфект**. Патэнцыяльная энергія электрона *U(x)* у вакууме на адлегласці *x* ад плоскай паверхні металічнага катода пры адсутнасці (1) і наяўнасці (2) знешняга электрычнага поля; *Φ* — работа выхаду электрона з катода (запоўненыя электронамі ўзроўні энергіі ў зоне праводнасці пазначаны блакітным колерам), *ΔΦ* — памяншэнне работы выхаду знешнім полем.

ШО́У (Shaw) Ірвін (27.2.1913, Нью-Йорк — 16.5.1984), амерыканскі пісьменнік. Скончыў Бруклінскі каледж (1934). У ранніх творах тэмы фашызму, 2-й сусв. вайны, у пазнейшых — пасляваен. амер. і зах.-еўрап. рэчаіснасць. Звяртаўся да праблем «амерыканскай мары» і «амерыканскай трагедыі», сям'і і грамадства, самасцвярджэння асобы і яе індывід. адказнасці, лёсу мастацтва ва ўмовах камерцыялізацыі культуры. Аўтар п'ес «Пахавайце мёртвых» (1936), «Простыя людзі» (1939), «Забойца» (1944), раманаў «Маладыя львы» (1948), «Трывожная атмасфера» (1950), «Вечар у Візантыі» (1973), «Хлеб па водах» (1981), «Успамін страты» (1982), дылогіі «Багач, бядняк» (1970) і «Жабрак, злодзей» (1977), кніг апавяданняў, публіцыстыкі, кінасцэнарыяў і інш. Яго творы адметныя займальнасцю інтрыгі, напружанасцю сюжэта, псіхалагізмам, дакладнасцю рэалій.

Тв.: Рус. пер. — Солнечные берега реки Леты. М., 1969; Богач, бедняк; Нищий, вор. М., 1986.

Літ.: Белов С. Ирвин Шоу: профессия — беллетрист // Иностр. лит. 1983. № 6.

Е.А.Лявонава.

ШОЎК (ад стараж.-сканд. silki), натуральная тэкстыльная нітка жывёльнага паходжання. Выдзяляецца спец. залозамі вусеняў *тутавага шаўкапрада* пры звіванні коканаў. Складаецца з бялковых рэчываў фібраіну (70—80%) і серыцыну (20—30%), воскаў, тлушчаў, мінер. рэчываў. Пры размотванні коканаў атрымліваюць Ш.-сырэц для вытв-сці *шаўковых тканін*. Вызначаецца тонкасцю, вял. гіграскапічнасцю, умераным бляскам; лёгка афарбоўваецца, устойлівы да дзеяння мінер. к-т, малаўстойлівы да дзеяння шчолачаў. Пад уздзеяннем святла і кісларoду паветра траціць трываласць.

ШО́ФМАН Аркадзь Сямёнавіч (15.11.1913, г. Віцебск — 7.10.1993), расійскі гісторык. Д-р гіст. н. (1964), праф. (1964). Засл. дз. нав. Рэспублікі Татарстан (1992). Скончыў Ленінградскі ун-т (1938). Працаваў у Ленінградзе, у Ашхабадскім ун-це (1941—48). З 1948 у Казанскім ун-це (у 1948—88 заг. кафедры ўсеагульнай гісторыі). Даследаваў гісторыю ант. Македоніі, ранняга элінізму, гістарыяграфію і метадалогію ант. гісторыі.

Тв.: История античной Македонии. Ч. 1—2. Казань, 1960—63; Восточная политика Александра Македонского. Казань, 1976; Распад империи Александра Македонского. Казань, 1984; Древний мир в лицах и образах. Казань, 1990.

А.Г.Зельскі.

ШО́ФМАН Леанід Ісакавіч (н. 5.7.1937, г. Гарадок Віцебскай вобл.), бел. вучоны ў галіне аграноміі. Д-р с.-г. н. (1996). Скончыў Віцебскі вет. ін-т (1961). З 1969 на Мінскай абласной с.-г. доследнай станцыі (з 1997 нам. дырэктара). Навук. працы па стварэнні складаных аграфітацэнозаў адна- і шматгадовых кармавых культур, вытв-сці кармоў з пасеваў розных відаў, распрацоўцы якасных параметраў ацэнкі ўраджаю.

Тв.: Біялагічныя асаблівасці фарміравання ўраджаю аднагадовых бабовых // Весці АН БССР. Сер. с.-г. навук. 1987. № 1; Однолетние кормовые культуры в составе смесей. Мн., 1997; Сравнительная эффективность разных приемов интенсивного использования пашни // Междунар. агр. журн. 1999. № 4.

ШО́ХАТ (Shohat) Джэймс Аляксандр (сапр. Якаў Аляксандравіч; 18.11.1886, в. Рагозна Брэсцкага р-на — 8.10.1944), расійскі і амерыканскі матэматык. Чл. Амер. матэм. т-ва (1923), Ін-та матэм. статыстыкі. Скончыў С.-Пецярбургскі ун-т (1910). З 1917 праф. Уральскага ун-та, з 1921 — С.-Пецярбургскага пед. ін-та. З 1923 у ЗША. З 1924 у Мічыганскім, з 1930 у Пенсільванскім ун-тах. Навук. працы па тэорыі артаганальных мнагачленаў. У тэорыі імавернасцей рашыў праблему збежнасці момантаў (тэарэма Фрэшэ—Ш., 1931). Даў першае сістэматычнае выкладанне тэорыі артаганальных мнагачленаў Чабышова (1934).

М.М.Касцюковіч.

ШО́ША, рака ў Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Зах. Дзвіна. Даўж. 30 км. Пл. вадазбору 304 км^2. Выцякае з воз. *Шо* за 1,4 км на ПдУ ад в. Надазер'е, упадае ў воз. *Пліса* з У, за 2 км на ПдЗ ад в. Прудаўё. Цячэ па Ушацка-Лепельскім узв., у вярхоўі і сярэднім цячэнні па лясістай мясцовасці. Асн. прытокі: Чысцянка і Лучайка (злева). Даліна скрынкападобная, звілістая, шыр. 500 м — 2 км, месцамі да 4 км. Пойма вузкая, чаргуецца па берагах, месцамі адсутнічае. Рэчышча звілістае, слабаразгалінаванае, шыр. ад 3—5 м у верхнім цячэнні да 12 м у сярэднім і ніжнім. Берагі стромкія, абрывістыя. У сярэднім цячэнні прымае сцёк з меліярац. каналаў.

ШО́ШЧЫЦ Мікалай Іосіфавіч (24.5.1918, с. Гальчынцы Цеафіпальскага р-на Хмяльніцкай вобл., Украіна — 21.12.1996), бел. дзеяч самадзейнага мастацтва, педагог. Засл. арт. Беларусі (1963). Скончыў Брэсцкае муз. вучылішча (1955). У 1954—86 (з перапынкам) выкладаў у Брэсцкім пед. ін-це, адначасова ў 1954—74 арганізатар і маст. кіраўнік Брэсцкай нар. хар. капэлы Дома культуры чыгуначнікаў. З 1986 узначальваў хор ветэранаў вайны і працы (з 1989 нар.) Брэсцкага гар. Дома культуры. У сваёй дзейнасці асаблівую ўвагу аддаваў гіст.-патрыят. тэматыцы і бел. песеннаму фальклору.

ШО́ШЫНСКАЯ АПЕРА́ЦЫЯ 1942, аперацыя партызан па знішчэнні чыг. моста цераз р. Шоша на чыг. лініі Маладзечна—Полацк у Глыбоцкім р-не 17.9.1942 у Вял. Айч. вайну. Яе праводзілі 1-ы і 3-і партыз. атрады брыгады «Смерць фашызму» (камандзір У.В.Мельнікаў) і партыз. група М.З.Умінскага, што ў ліп. 1942 прыбыла з-за лініі фронту. Мост (даўж. 35 м) ахоўваў ням. гарнізон, абапал моста знаходзіліся дзоты, акопы, загароды з дроту. У бліжэйшых гарнізонах праціўніка на ст. Падсвілле і Зябкі было каля 170 гітлераўцаў. У ноч на 17 вер. партызаны выставілі заслон з боку казармаў, захапілі дзот і кулямётным агнём скавалі дзеянні праціўніка, чым далі магчымасць падрыўнікам замініраваць і ўзарваць мост. У выніку аперацыі рух паяздоў быў спынены на 15 сутак.

М.У.Філімоненкаў.

ШПА́АР (Spaar) Дзітар (н. 21.9.1933, в. Зальца каля г. Нордгаўзен, Германія), нямецкі вучоны ў галіне с.-г. навук. Д-р с.-г. н. (1964), праф. (1968). Правадз. чл. Акадэміі с.-г. навук ГДР (1972), замежны чл. УАСГНІЛ (1982), Польскай АН (1988), Рас. акадэміі с.-г. навук (1990), Агр. АН Беларусі (1996). Скончыў Маскоўскую с.-г. акадэмію імя К.А.Ціміразева (1958). З 1970 дырэктар Ін-та фітапаталогіі (г. Ашэрслебен). З 1977 віцэ-прэзідэнт, з 1987 прэзідэнт Акадэміі с.-г. навук ГДР. З 1991 дырэктар Берлінскай арг-цыі па сельскай гаспадарцы. Навук. працы па вірусных і бактэрыяльных хваробах раслін Еўропы, раслінаводстве асн. с.-г. культур.

Тв.: Рус. пер. — Бактериозы культурных растений: Справ. кн. М., 1980 (у саўт.); Картофель. 2 изд. Мн., 1999 (у саўт.); Яровые масличные культуры. Мн., 1999 (у саўт.); Зерновые культуры. 2 изд. Мн., 2000 (у саўт.).

ШПА́ГА (ад італьян. spada), колючая, радзей колюча-сякучая *холодная зброя*. Складаецца з прамога доўтага (да 1 м і больш) адно або 2-лязовага плоскага з долямі або гранёнага клінка і рукаяткі (*эфеса* з гардай і дужкай рознай формы). У Зах. Еўропе мела шырокае распаўсюджанне з 16 ст.; была адметнай зброяй дваран, знаходзілася на ўзбраенні пяхоты да 18 ст. і конніцы да 19 ст. (з 18 ст. паступова выцяснялася *палашом* і *шашкай*). Захавалася як ганаровая зброя, з 20 ст. як спарт. (выкарыстоўваецца ў *фехтаванні*, а таксама ў некат. краінах як ганаровая або парадная зброя.

ШПА́ГІН Георгій Сямёнавіч (29.4.1897, в. Клюшнікава Каўроўскага р-на Уладзімірскай вобл., Расія — 6.2.1952), расійскі канструктар стралк. зброі. Герой Сац. Працы (1945). З 1920 слесар на кулямётным з-дзе. З 1922 удзельнічаў у канструяванні новых узораў зброі (6,5 мм спараныя ручны і танкавы кулямёты — з У.Р.*Фёдаравым*; 7,62 мм танкавы кулямёт — з В.А.*Дзегцяровым* і інш.). У 1938 стварыў (з Дзегцяровым) буйнакаліберны кулямёт ДШК, а ў 1940 — *пісталет-кулямёт* (аўтамат) ППШ. У 1943 распрацаваў асвятляльны пісталет ОПШ (гл. *Сігнальны пісталет*). Дзярж. прэмія СССР 1941.

Літ.: Болотин Д.Н. Советское стрелковое оружие за 50 лет. Л., 1967; Нагаев Г.Д. Русские оружейники. М., 1977.

ШПА́ЖНІК, род кветкавых раслін; тое, што *гладыёлус*.

ШПАК Аляксандр Пятровіч (н. 16.4.1948, с. Чапаеўка Кіеўскай вобл., Украіна), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1999). Скончыў Укр. с.-г. акадэмію (1971). З 1971 у Ін-це агр. эканомікі Нац. АН Беларусі (з 1994 нам. дырэктара). Навук. працы па праблемах агр. адносін, інвестыцыйнай дзейнасці ў галіне сельскай гаспадаркі. Распрацаваў канцэпцыю агр. рэформы, якая пакладзена ў аснову рэсп. і абл. праграм рэфармавання і ўдасканалення АПК Беларусі, яго пераходу да рынкавай сістэмы гаспадарання.

Тв.: Концепция аграрной реформы в Республике Беларусь. Мн., 1994; Инвестиционная деятельность в системе АПК. Мн., 1998; Ускорение реформ на селе — кратчайший путь к его возрождению // Агроэкономика. 2000. № 2; Как нам провести земельную реформу (разам з К.В.Рахатко) // Сейбіт. 2002. № 4; Совершенствование аграрных отношений в условиях трансформационной экономики Республики Беларусь. Мн., 2003 (з ёй жа).

ШПАК Георгій Іванавіч (н. 8.9.1943, г. Асіповічы Магілёўскай вобл.), расійскі ваен. дзеяч. Ген.-палкоўнік (1997). Д-р пед. н. (2000). Скончыў Разанскае вышэйшае паветр.-дэсантнае вучылішча (1966), Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1978), Ваен. акадэмію Генштаба (1988). Удзельнік баявых дзеянняў у Афганістане ў складзе абмежаванага кантынгента сав. войск (1979—1981), служыў на камандных і штабных пасадах у Беларускай, Прыбалтыйскай, Адэскай, Ленінградскай, Туркестанскай і Прыволжска-Уральскай ваен. акругах. У 1990-я г. распрацоўваў планы ваен. аперацый у Чэчні, удзельнічаў у міратворчых аперацыях у Босніі. З 1996 каманд. паветр.-дэсантнымі войскамі Рас. Федэрацыі.

Літ.: Памяць: Гіст.-дак. хроніка Асіповіцкага р-на. Мн., 2002. С. 632—638.

Б.Дз.Далгатовіч.

ШПА́КАЎ Аляксей Пракопавіч (н. 23.3.1929, в. Вербеж Чэрыкаўскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне заатэхнікі. Д-р с.-г. н. (1983), праф. (1984). Скончыў Віцебскі вет. ін-т (1953), працуе ў Віцебскай акадэміі вет. медыцыны (у 1975—2000 заг. кафедры). Навук. працы па вывучэнні кармоў Беларусі, прадуктаў мікрабіял. сінтэзу, кармавых дабавак; распрацоўцы рэцэптаў камбісіласаў, бялкова-вітамінна-мінер. дабавак, камбікармоў і выкарыстанні іх у свінагадоўлі.

Тв.: Силосование кормов: (Справ. материалы). Мн., 1965 (разам з У.П.Лемешам, В.К.Назаравым); Кормовые нормы и таблицы. 2 изд. Мн., 1973 (з імі ж); Приготовление и использование кормовых смесей и комбикормов в хозяйствах. Мн., 1988 (разам з М.Ф.Садоўскім); Кормовые нормы и состав кормов: Справ. пособие. Мн., 1991 (у сааўт.).

ШПАКІ́ (Sturnus), род птушак сям. шпаковых атр. вераб'інападобных. 14 відаў. Пашыраны ў Еўразіі, Паўн. Афрыцы. На Беларусі 1 від — Ш. звычайны (S. vulgaris); інтрадукаваны таксама ў Паўн. Амерыцы, Паўд. Афрыцы, Аўстраліі, Новай Зеландыі, на многіх акіянічных астравах. Жыве ў разрэджаных лясах, садах, парках, антрапагенных ландшафтах.

Даўж. цела Ш. звычайнага да 24 см, маса да 85 г. Апярэнне чорнае з зеленавата-сінім або фіялетавым метал. бляскам і светлымі стракацінамі па краях пёраў, у маладых — цёмна-бурае. Целасклад шчыльны, шыя кароткая, ногі моцныя, 4-пальцыя, з буйнымі кіпцюрамі. Дзюба вострая, тонкая і доўгая, крыху загнутая ўніз, жоўтая. Крылы доўгія, завостраныя. Хвост кароткі. Нясе да 8 (часцей 5—6) яец. Корміцца рознымі беспазваночнымі і расл. кормам (ягадамі вішні, чарэшні, вінограду). Карысць Ш. значна большая за шкоду, і чалавек прываблівае іх, будуе шпакоўні і дуплянкі. Некат. Ш. могуць пераймаць галасы інш. птушак, жывёл і чалавека.

ШПАКЛЁЎКА, пастападобны *лакафарбавы матэрыял* для выраўноўвання (шпаклявання) паверхняў перад нанясеннем на іх фарбаў. У састаў Ш. ўваходзяць плёнкаўтваральныя рэчывы (напр., *алкідныя смолы* ці *эпаксідныя смолы*), запаўняльнікі (*мел, тальк, барыт*) і пігменты (напр., цынкавыя бялілы, вохра). Адрозніваюць Ш. лакавыя, алейныя, клеявыя. Наносяць на пакрытую антыкаразійнымі матэрыяламі (*грунтоўкамі*) паверхню; слой, што высах, шліфуюць абразіўнай шкуркай. Лакавыя Ш. выкарыстоўваюць у машынабудаванні, алейныя і клеявыя — пераважна ў буд-ве.

Шпага з брыльянтавай агранкай. 2-я пал. 18 ст.

ШПАКО́ВЫЯ (Sturnidae), сямейства птушак атр. вераб'інападобных. Паводле розных сістэм класіфікацыі 24—36 родаў, 104—111 відаў. Пашыраны ў Еўразіі, Афрыцы, Аўстраліі, акліматызаваны ў Паўн. Амерыцы, Новай Зеландыі, на некат. акіянічных астравах. Жывуць у лесастэпах, стэпах, пустынях, лясах і інш. На Беларусі 2 віды: шпак звычайны (Sturnus vulgaris) і залётны від шпак ружовы (Pastor roseus).

Даўж. цела 17—45 см, маса 50—150 г. Апярэнне ў большасці цёмнае, карычневае або чорнае з метал. бляскам, у некат. яркае, чырв., сіняе і інш. Самцы буйнейшыя за самак. Крылы завостраныя ці закругленыя. Ногі моцныя. Дзюба прамая, радзей злёгку кручкаватая. Нясуць 2—9 (часцей 4) яец. Кормяцца насякомымі і іх лічынкамі, дробнымі беспазваночнымі, ягадамі, насеннем і інш. Многія добра спяваюць, могуць пераймаць галасы інш. птушак і розныя гукі.

ШПАКО́ЎСКІ Іван Сцяпанавіч (н. 14.8.1936, в. Мясяцічы Пінскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. літаратуразнавец. Канд. філал. н. (1967). Скончыў Брэсцкі пед. ін-т (1959). Настаўнічаў. Працаваў у Маларыцкай раённай газеце, выкладаў у Брэсцкім, Нежынскім і Кіеўскім пед. ін-тах. З 1969 у Ін-це л-ры АН Беларусі. З 1989 у Бел. пед. ун-це. Даследуе праблемы тэорыі л-ры, шляхі развіцця бел., рус. і ўкр. паэзіі, індывід. асаблівасці стылю Р.Барадуліна, А.Вярцінскага, В.Зуёнка, У.Караткевіча, А.Куляшова, П.Панчанкі, А.Пысіна, М.Танка. Аўтар манаграфій «Структура вершаванага вобраза: Умоўная асацыятыўнасць у сучаснай савецкай паэзіі» (1972), «Тыпізацыя ў лірыцы: Формы і сродкі» (1980), «Узрушанасць: Артыкулы пра сучасную беларускую паэзію» (1978). Сааўтар кніг «Пытанні паэтыкі» (1974, з В.Жураўлёвым, А.Яскевічам), «Адзінства і ўзаемаўзбагачэнне» (1980), «Паэзія абнаўлення свету» (1981), вучэбнага дапаможніка для ВНУ «Беларуская літаратура XX ст.» (2001, з М.Мішчанчуком).

ШПАКО́ЎСКІ Мікалай Іванавіч (5.4.1940, в. Ботава Пінскага р-на Брэсцкай вобл. — 12.1.2001), бел. вучоны ў галіне хірургіі і геранталогіі. Д-р мед. н. (1994). Чл. Рас. АМН (з 1995), чл.-кар. Міжнар. акадэміі геранталогіі (з 1998). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1963). У 1963—65 гал. ўрач Парахонскай бальні-

цы (Брэсцкая вобл.). З 1968 у 6-й клінічнай бальніцы Мінска, з 1971 у Мінскай абл. клінічнай бальніцы. Навук. працы па хірург. лячэнні пасляаперацыйных вентральных грыж, пластыцы дэфектаў пярэдняй брушной сценкі.

Тв.: Электраміятрафічны аналіз стану мышцаў пярэдняй брушной сценкі ва ўмовах дублікатуры прамых мышцаў жывата (разам з Г.Ф.Малюковічам) // Весці АН БССР. Сер. біял. навук.1989. № 4, Морфофункциональная оценка эффективности хирургической пластики передней брюшной стенки при миопексии (разам з Л.Я.Бойка, Я.Т.Валадзько) // Эмбриологические и экспериментально-морфологические аспекты структурно-функциональных взаимоотношений в организме. Мн., 2001.

ШПАКО́ЎШЧЫНА, вёска ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., на р. Нача. Цэнтр сельсавета. За 36 км на З ад г. Полацк, 140 км ад Віцебска, 15 км ад чыг. ст. Ветрына. 520 ж., 255 двароў (2003). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік архітэктуры — Спаса-Праабражэнская царква (2-я пал. 19 ст.).

ШПАЛЕ́РНАЯ КУЛЬТУ́РА, спосаб вырошчвання с.-г. культур (вінограду, персікаў, яблынь, хмелю, агуркоў, памідораў і інш.), пры якім іх надземную ч. прымацоўваюць да *шпалеры* ў адной ці двух плоскасцях. Шпалерай служаць рашоткі з рэек, калкі з нацягнутым дротам і інш. Ш.к. дазваляе больш рацыянальна выкарыстоўваць глебу і сонечную энергію, механізаваць працэсы догляду за раслінамі і збор ураджаю.

ШПАЛЕ́РЫ (ням. Spalier ад італьян. spalliera), 1) насценныя гладкатканыя дываны, выкананыя ў тэхніцы т.зв. рэпсавага ўточнага перапляцення. Выява ўтвараецца чаргаваннем рознакаляровых нітак утку (шэрсць, шоўк, часам залатыя ці сярэбраныя ніткі), якія перадаюць паступовую змену тону або рэльефнасці і, шчыльна закрываючы нефарбаваную аснову (шэрсць, лён), ствараюць характэрную рубчастую фактуру. Ш. ўзнаўляюць узор або карціну ў натуральную велічыню з кардону, які найчасцей выконваўся паводле мініяцюр, гравюр ці карцін вядомых мастакоў.

Вытокі ткацкай тэхнікі Ш. у маст. тканінах Стараж. Грэцыі, Месапатаміі, копцкіх тканінах 3—12 ст. У Зах. Еўропе Ш. вядомы з канца 11 ст. Дасягнулі росквіту ў 2-й пал. 14 ст. ў творах майстроў Парыжа, Араса, Турнэ і Бруселя, калі геам., расл. і геральдычныя матывы змяніліся сюжэтнымі выявамі рэліг., міфалагічнай, гісторыка-рамант. тэматыкі, серыямі, прысвечанымі ўшанаванню каралеўскіх і магнацкіх родаў: «Апакаліпсіс» (ткач Н.Батай, мастак Ж.Бандоль, 1377—80), серыя «Дзевяць герояў» (каля 1385, усе парыжская школа), «Дама з аднарогам», «Паляванне на аднарога», «Тры каранаванні» (усе канец 16 ст., брусельская школа) і інш. У 17 ст. агульнаеўрап. вядомасць набылі вырабы каралеўскай мануфактуры габеленаў у Парыжы (серыі «Гісторыя Аляксандра», «Гісторыя караля», «Месяцы», «Каралеўскія дамы» і інш.), пасля чаго да 19 ст. ўсе Ш. сталі называць *габеленамі*. Сярод мастакоў, якія выконвалі эскізы і кардоны для Ш., П. да Картона, Н.Пусэн, П.П.Рубенс і інш.

На Беларусі Ш. выраблялі ў канцы 17 — 1-й пал. 19 ст. на ткацкіх мануфактурах (тапіцэрыях) кн. Радзівілаў у Бяла-Падлясцы (цяпер Польшча), Нясвіжы (Мінская вобл.), Альбе (цяпер у межах Нясвіжа), Міры (Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл.), Карэлічах (гл. *Карэліцкія шпалеры*), кн. Агінскіх у Слоніме (Гродзенская вобл.; 12 Ш. з выявамі ант. статуй, у т.л. «Флейтыст», «Амфітрыта», «Вакханка», «Геркулес»), на каралеўскіх мануфактурах А.Тызенгаўза ў Гродне. У сучасным габеленавым ткацтве да традыц. гладкатканай тэхнікі і кампазіцыйнай пабудовы Ш. звярталіся Л.Пятруль, Ф.Шунейка і інш. 2) Рулонная папера (узорыстая ці аднатонная) для абклейкі сцен, столі і інш. Працэсы вытв-сці: выраб друкавальнай формы (клішэ), друкаванне малюнка на машыне, сушка і перамотка. Адрозніваюць Ш. звычайныя, вільгацеўстойлівыя (якія можна мыць) і гукапаглынальныя (варсаваныя). На Беларусі вырабляюцца на *Мінскай шпалернай фабрыцы*, *Гомельскім акцыянерным таварыстве «Гомельшпалеры»*. 3) У садова-паркавым мастацтве рады дрэў, кустоў абапал дарогі ці дарожкі, якія ўтвараюць алеі. Выкарыстоўваюцца пераважна пры стварэнні рэгулярных кампазіцый. Алеі маглі мець выгляд калідораў з высокімі зялёнымі сценамі, у якіх праразаліся «дзверы» і «вокны». Падобныя сцены могуць акаймоўваць прамавугольнікі *баскетаў*, аддзяляюць партэры ад бакавых алей, служаць фонам, на якім размяшчаюцца скульптуры. Жывую агароджу робяць з граба, ліпы, бука ляснога, а таксама з некаторых высокарастучых кустоў. На Беларусі Ш. вядомы ў парках вёсак Воўчын Камянецкага р-на Брэсцкай вобл., Дзярэчын Зэльвенскага, г.п. Казлоўшчына Дзятлаўскага р-наў Гродзенскай вобл., вёсак Бачэйкава Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл., Альба Нясвіжскага р-на Мінскай вобл. і інш. Ш. наз. таксама рашотку-апору для прымацавання павойных раслін. 4) Рады, шарэнгі

Шпалеры «Юнакі, якія кідаюць ружы свінням і зерне галубам». Фрагмент. Францыя. Пач. 16 ст.

Шпалеры «Бітва пад Славечнай» (фрагмент). Карэлічы. 2-я пал. 18 ст.

Шпалеры.

войск па абодва бакі руху каго-н. або чаго-небудзь.

Літ.: Трызна Дз.С. Беларускія дываны і габелены. Мн., 1981. *С.У.Пешын, В.Р.Анціпаў.*

ШПА́ЛЬНЫ ГРЫБ, пілаліснік лускаваты, гл. ў арт. *Пілаліснік.*

ШПА́НАЎКА, другая назва р. *Спанаўка* ў Брэсцкім р-не.

ШПАНГО́ЎТ (галанд. spanthout ад spant бэлька, рабро + hout дрэва), 1) папярочная бэлька (рабро цвёрдасці) *набору* корпуса судна (бартавой абшыўкі паміж днішчам і палубай) або *фюзеляжа* лятальнага апарата, да якой мацуюць *стрынгеры* і абшыўку. Надае канструкцыі патрэбную форму, трываласць і ўстойлівасць. 2) Відарыс папярочнага сячэння вонкавай паверхні корпуса судна на чарцяжы.

ШПА́НКІ (Meloidae), сямейства насякомых атр. жукоў, ці цвердакрылых. Больш за 4 тыс. відаў. Пашыраны пераважна ў субтропіках і тропіках. На Беларусі 8 відаў, 5 з іх з роду *майка* (1 — у Чырв. кнізе).

Даўж. 8—42 мм. Афарбоўка яркая, часта з метал. бляскам. Галава апушчаная, шыепадобна перацягнутая. Надкрылы шырэй за пярэдняспінку, не прылягаюць да бакоў брушка. Вусікі 8—11-членікавыя, шнура- або ніткападобныя, на канцах патоўшчаныя. Ператварэнне поўнае, ускладненае. Лічынкі маюць 3 стадыі, кормяцца яйцамі саранчовых, мёдам, паразітуюць у гнёздах пчол, знішчаюць іх патомства. Дарослыя жукі аб'ядаюць кветкі і лісце раслін. Характэрная асаблівасць Ш. — наяўнасць у целе (асабліва ў крыві) яду кантарыдзіну, які надае жукам непрыемны пах і смак, таму большасць насякомаедных іх не паядаюць (акрамя курэй, ластавак, вожыкаў). Іл. гл. таксама да арт. *Майкі.*

Шпанкі: 1 — майка зменлівая, ці стракатая; 2 — майка чорная; 3 — нарыўнік малы; 4 — нарыўнік чырвонагаловы; 5 — нарыўнік Шэфера; 6 — шпанская, ці ясянёвая мушка.

ШПЕ́МАН (Spemann) Ганс (27.6.1869, г. Штутгарт, Германія — 12.9.1941), нямецкі эмбрыёлаг. Вучыўся ва ун-тах Гайдэльберга, Вюрцбурга, Мюнхена. Праф. Ростакскага (1908—14) і Фрайбургскага (1919—37) ун-таў. У 1914—19 дырэктар Ін-та біялогіі (Берлін). Навук. працы па эксперым. эмбрыялогіі земнаводных. Распрацаваў метады мікрахірург. аперацый на зародках. Устанавіў залежнасць развіцця адной ч. зародка ад другой. Сфармуляваў тэорыю «арганізатараў» — структур зародка, што выклікаюць дыферэнцыроўку тканак на позніх стадыях зародкавага развіцця. Нобелеўская прэмія 1935. *В.Ф.Ермакоў.*

Г.Шпеман.

П.І.Шпетны.

ШПЕ́НГЛЕР (Spengler) Освальд (29.5.1880, Бланкенбург, Германія — 29.5.1936), нямецкі філосаф; прадстаўнік *філасофіі жыцця*, адзін з заснавальнікаў *культуралогіі*. Вучыўся ў Берлінскім і Мюнхенскім ун-тах. У асн. працы «Занепад Еўропы» (т. 1—2, 1918—22) абгрунтаваў ідэю адасобленасці 8 культ.-гіст. тыпаў, якія ў сваім развіцці праходзяць усе стадыі жыццёвага цыкла: дзяцінства, юнацтва, памужнеласці, сталасці і памірання. Усе гэтыя культуры (егіп., вавілонская, інд., кіт., мекс., ант., араб., еўрап.) разам з руска-сібірскай (культурай будучыні) адпавядаюць адна адной па тэмпах свайго развіцця і працягласці існавання (каля тысячагоддзя). Паводле Ш., кожная культура як сукупнасць сімвалаў мае свой уласны прасімвал, які з'яўляецца яе «душой», сістэмастваральным пачаткам; як толькі «душа» культуры ажыццявіла ўсю паўнату сваіх магчымасцей у розных культ. формах (мова, веравызнанне, мастацтва, навука, дзяржава) культура прыходзіць у заняпад і становіцца *цывілізацыяй*. На яго думку, цывілізацыя нясе «згасанне душы» культуры, перавагу рацыяналізму над ісцінай, прагматызму над натхненнем, перанасычанасць усіх бакоў жыцця тэхнікай і арганізац. формамі, якія падпарадкоўваюць сабе чалавека. Адмовіўся ад ідэі адзінага сусв.-гіст. развіцця і прагрэсу як агульнай яго накіраванасці, але ў сваёй перасцярозе пра апакаліпсіс зах. свету звярнуў увагу на неабходнасць захавання і развіцця культуры як найважнейшага шансу лепшай будучыні чалавецтва.

Тв.: Рус. пер. — Философия будущего. Иваново-Вознесенск, 1922; Деньги и машина. Пг., 1922; Пессимизм ли это? М., 1922; Человек и техника. М., 1931; Закат Европы. Мн.; М., 2000. *Я.М.Бабосаў.*

ШПЕ́РГЕЛЬ, род кветкавых раслін; тое, што *свінакроп*.

ШПЕ́ТНЫ Павел Іванавіч (1913, в. Гдзень Брагінскага р-на Гомельскай вобл. — 13.7.1943), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Слуцкае ваен. пяхотнае вучылішча (1939). У Чырв. Арміі з 1935. У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 на фронце. Камандзір узвода бранябойшчыкаў ст. лейтэнант Ш. вызначыўся ў Курскай бітве 1943: 12—13 ліп. ў баі за вышыню каля в. Паляжаеў Белгародскай вобл. з процітанк. ружжа падбіў 6 танкаў ворага; калі скончыліся боепрыпасы, з процітанк. гранатамі кінуўся пад варожы танк, падарваў яго і сябе.

ШПІГЕЛЬМА́Н Нута Аўрум-Эльевіч (28.5.1921, г.п. Валадарск-Валынскі Жытомірскай вобл., Украіна — 27.10.1974), бел. архітэктар. Засл. архітэктар Беларусі (1974). Скончыў Маскоўскі арх. ін-т (1945). Працаваў у розных праектных арг-цыях Мінска, з 1950 гал. архітэктар ін-та «Белпрампраект», з 1961 у ін-це «Мінскпраект» (у 1964—71 гал. архітэктар). Асн. работы: у Мінску — будынкі прыгараднага чыг. вакзала (1953), паліграф. камбіната (1956), карпусы з-да ЭВМ і ін-та замежных моў (1961), гадзіннікавага з-да, НДІ водных праблем і Рэсп. вылічальны цэнтр па вул. Я.Коласа (усе 1963), Цэнтр. н.-д. і праектна-тэхнал. ін-т арганізацыі і тэхнікі кіравання па Партызанскім праспекце (1967—73), Ін-т нар. гаспадаркі, рэстаран «Журавінка» (абодва 1968), жылая забудова па праспекце Машэрава (1980, усе ў сааўт.) і інш.; з-ды швейных (1950—53) і дарожных (1953, абодва ў сааўт.) машын у г. Жодзіна Мінскай вобл., дывановы і панчошны камбінаты ў Брэсце (1968). Распрацаваў серыі 5—9-павярховых жылых дамоў для масавага буд-ва (1966, у сааўт.). Дзярж. прэмія Беларусі 1968 за ўдзел у стварэнні арх. ансамбля *Скарыны праспекта* ў Мінску. *В.М.Чарнатаў.*

ШПІЛЕ́ЎСКІ Павел Міхайлавіч (12.11.1823, в. Шыпілавічы Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл. — 29.10.1861), бел. і рус. этнограф, фальклярыст, пісьменнік, публіцыст, тэатр. крытык. Канд. багаслоўя (1847). Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1843), Пецярб. духоўную акадэмію (1847). З 1847 выкладаў славеснасць у Варшаўскім пав. духоўным вучылішчы, з 1853 служыў у Гал. пед. ін-це ў Пецярбургу, у 1855—59 настаўнік школы пры Экспедыцыі падрыхтоўкі дзярж. папер. Друкаваўся з 1846. Супрацоўнічаў з пецярб. перыяд. выданнямі. Пісаў пад псеўд. Драўлянскі, Знаёмы чалавек, Барон Ікс. Вывучаў гісторыю, побыт, вусную нар. творчасць і мову беларусаў. Аўтар нарысаў і арт. «Беларускія народныя павер'і» (1846—52), «Апісанне пасольства

Льва Сапегі ў Маскве ў 1600 г.» (1850), «Народныя прыказкі з тлумачэннем паходжання і значэння іх» (1852), «Даследаванне пра ваўкалакаў: На падставе беларускіх павер'яў» (1853), «Вясельныя абрады ў засцянкоўцаў (акалічан) Віцебскай губерні» (1854), «Мазыршчына: (З падарожжа па заходнярускім краі)» (1859), «Паездка ў заходнія губерні» (1860). Цыклы белетрызаваных нарысаў «Падарожжа па Палессі і беларускім краі» (1853—55) і «Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе казках» (1853—56) прынеслі Ш. вядомасць у рас. друку як аднаму з першых даследчыкаў і папулярызатараў бел. гісторыі, этнаграфіі і фальклору. Нарысы сумяшчалі аўтарскія навук. разважанні і лірычныя адступленні, гіст. даведкі і маляўнічыя апісанні бел. гарадоў, вёсак і мястэчак, фальклор. запісы і этнагр. замалёўкі. Ш. належыць таксама спроба стварэння слоўніка і граматыкі бел. мовы («Слоўнік і каранняслоў беларускай гаворкі», 1845, рукапіс). Даследаваў таксама гісторыю, мову і фальклор літ. народа («Нарысы Жмудзі», 1855). Аўтар зб. «Беларускія прыказкі» (1853), апавяданняў «Нарысы польскіх звычаяў» (1854), аповесці для дзяцей «Цыганё» (1855), серыі апавяданняў «Заходнярускія нарысы» (1858—59). У аснову драмы «Дажынкі» (1857), якая ўяўляе сабой варыяцыю на тэму «Ідыліі» В.Дуніна-Марцінкевіча, пакладзены бел. этнагр. абрад. У журналісцкія агляды ўключаў весткі з Беларусі, першы паведаміў пра творчасць Дуніна-Марцінкевіча, рэцэнзаваў спектаклі Мінскага т-ра. Непаслядоўнасць і супярэчлівасць светапогляду Ш., які вагаўся ад дэмакратызму і памяркоўнай ліберальнасці да адкрытай рэакцыйнасці, выклікалі нападкі на яго рас. кансерватараў і рэзкую крытыку з боку дэмакр. колаў (палеміка вакол «Заходнярускіх нарысаў»). Творы Ш., прысвечаныя Беларусі, сцвярджалі нац. самабытнасць бел. народа, садзейнічалі фарміраванню бел. нац. культуры і л-ры.

Тв.: Путешествие по Полесью и белорусскому краю. Мн., 1992.

Літ.: Кузняева С.А. Русская дореволюционная печать и советское литературоведение о Павле Шпилевском // Книга в Белоруссии: Книговедение, источники, библиогр. Мн., 1981; Германовіч І.К. П.М.Шпілеўскі // Германовіч І.К. Беларускія мова-знаўцы. Мн., 1985; Цішчанка І.К. Да народных вытокаў. Мн., 1986. *С.А.Кузняева.*

ШПІЛЬ (галанд. spil, ням. Spille) у архітэктуры, вертыкальнае вастраканцовае завяршэнне будынкаў у выглядзе моцна выцягнутых конуса ці піраміды. Часта ўвянчаны скульпт. ці разной выявай, сімвалічнай фігурай, сцягам, флюгерам і інш. У Зах. Еўропе пашыраны ў вежах гатычных збудаванняў, вядомы таксама ў архітэктуры Усходу, з 16 ст. — у Расіі (Ш. Адміралцейства ў С.-Пецярбургу). На Беларусі ў 16—17 ст. Ш. завяршалі замкавыя вежы, ратушы (Гродна, Магілёў), будынкі гасціных двароў (Віцебск), палацаў і сядзібных дамоў. З 18 ст. выкарыстоўваліся ў палацавым дойлідстве стыляў рококо і класіцызму (Гродзенскі Новы замак). Найб. пашыраны ў пабудовах стыляў псеўдарус. і несапраўднай готыкі (касцёл у в. Трабы Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл.). У 1950-я г. Ш. завяршалі буйныя грамадскія і жылыя будынкі (жылы дом на вул. Камуністычнай у Мінску, будынак чыг. вакзала ў Брэсце).



Шпіль. Малюнак.

Шпінат агародны. Сарты: 1 — Велічэзны; 2 — Вікторыя.

ШПІЛЬМАНЫ (ад ням. Spielleute, адз. л. Spielmann), нямецкія сярэдневяковыя вандроўныя акцёры, спевакі, музыканты. Стваралі і выконвалі эпічныя песні, а таксама творы апавяд. і гумарыстычнага жанраў бюргерскай л-ры, якая зараджалася. Выступалі ў дварах феадалаў і ў нар. аўдыторыі, на кірмашах, у вёсках, гарадах. Росквіт паэзіі Ш. — 12 ст.; з 13 ст. Ш. асядалі ў гарадах, станавіліся членамі пеўчых цэхаў.

ШПІНА́Т (Spinacia), род кветкавых раслін сям. лебядовых. 3 віды. Пашыраны ў Еўразіі і Паўн. Амерыцы. Як харч. расліны вырошчваюць (у тл. на Беларусі) Ш. агародны (S. oleraceae) і туркестанскі (S. turkestanica); часам дзічэюць і трапляюцца каля жылля.

Адна- і двухгадовыя травяністыя расліны выш. да 70 см. Лісце чаргаванае, трохвугольна-коп'епадобнае, суцэльнакрайняе, на доўгіх чаранках. Мужчынскія кветкі сабраны ў мяцёлку, жаночыя размешчаны ў пазухах лісця. Плод — арэшак. Лісце Ш. мае бялкі (34%, саступае толькі мясу), вугляводы, вітаміны С, групы В, каравін, солі жалеза і фосфару. Спажываецца свежым і кансерваваным.

Дз.І.Траццякоў.

ШПІ́НДЭЛЬ (ням. Spindel літар. — верацяно), 1) вярчальны вал металарэзных і дрэваапрацоўчых станкоў, які злучаны з *прыводам* і мае прыстасаванне для замацавання загатоўкі, вырабу ці рэзальнага інструменту. 2) Прамежкавы вал, што перадае вярчэнне ад прывадного вала (рухавіка) ці *рэдуктара* да валкоў *пракатнага стана*. 3) Тонкі і гнуткі стрыжань *верацяна*. 4) Рабочы орган (вярчальны вал) бавоўнаўборачных машын. 5) Стрыжань клапана ці вось суднавога шпіля — механізма для падымання якара, рыбалоўных сетак і інш.

ШПІНЕ́ЛІ (італьян. spinella ад лац. spina шып, цярноўнік), група мінералаў падкласа складаных аксідаў, для якіх характэрны шырокі *ізамарфізм*. Вылучаюць алюмашпінелі (уласна шпінель), фершпінелі (*магнетыт*), *хромшпінеліды*, манганшпінелі (*гаўсманіт*), тытанаі ванадыяшпінелі. Утвараюць руды на жалеза, хром, марганец. Празрыстыя Ш. — ювелірныя камяні.

Шпінель.

Уласна шпінель ($MgAl_2O_4$) мае прымесі жалеза, цынку, марганцу, хрому, ванадыю і інш. Крышталізуецца ў кубічнай сінганіі. Утварае актаэдрычныя крышталі, сплошчаныя двайнікі зрастання (па т.зв. шпінелевым законе), радзей двайнікі прарастання. Паводле саставу і афарбоўкі вылучаюць высакародную шпінель (рубінавая, вогненна-чырвоная), сапфіравую (блакітная да сіняй), хлорашпінель (травяна- і аліўкава-зялёная); плеаназт, або цэйланіт (непразрыстая шэра-зялёная да чорнай) і інш. Бляск шкляны да тлустага. Цв. 8. Шчыльн. 3,6—3,7 г/см^3. Утвараецца пры метамарфізме, намнажаецца ў россыпах. Высакародная шпінель — ювелірны камень 3-га парадку, здабываецца з алювіяльных россыпаў М'янмы, в-ва Шры-Ланка.

Ю.В.**Шпіт**.

К.**Шпітэлер**.

ШПІТ Юрый Васілевіч (н. 9.11.1930, г. Запарожжа, Украіна), бел. архітэктар. Засл. архітэктар Беларусі (1969). Скончыў Кіеўскі інж.-буд. ін-т (1954). З 1954 у ін-це «Белдзяржпраект», з 1964 нам. старшыні Дзяржбуда Беларусі, з 1976 дырэктар БелНДІПгорадабудаўніцтва, адначасова з 1967 выкладае ў Бел. нац. тэхн. ун-це. У 1990—2002 кіраўнік персанальнай творчай майстэрні. Найб. значныя работы: у Мінску — жылыя дамы па вуліцах Я.Коласа, Чырвонаармейскай, К.Маркса (1960—70-я г.), Талбухіна (1965), будынак кінатэатра «Партызан» (1967), храм святога апостала Андрэя Першазванага на праспекце Ракасоўскага (2000); будынкі абкома КПБ у Магілёве (1971), гасцініцы міжнар. маладзёжнага цэнтра «Юнацтва» на Заслаўскім вадасх. пад Мінскам (1975), гаркома КПБ у г. Бабруйск Магілёўскай вобл. (1976, усе ў сааўт.), санаторыя «Беларусь» у г. Місхор (Крым, 1974), пансіяната «Свіцязь» (Навагрудскі р-н), санаторыя «Белая Русь» у п. Наваельня Дзятлаўскага р-на (абодва Гродзенская вобл., 1990-я г.), ашчаднага банка ў г. Старыя Дарогі Мінскай вобл. (1998) і інш. Адзін з кіраўнікоў і аўтараў серый тыпавых праектаў жылых дамоў, інтэрнатаў, школ і інш., шэрагу праектаў планіроўкі і забудовы асобных раёнаў у Мінску, гарадах Наваполацк Віцебскай вобл., Светлагорск Гомельскай вобл. і інш. (1950—80-я г.). Кіраўнік распрацоўкі ген. схемы комплекснай тэр. арганізацыі Беларусі (1986—89). Аўтар *Помніка вызваліцелям* у Віцебску і манумента партызанам Вілейшчыны на воз. Нарач (Мядзельскі р-н Мінскай вобл.; 1968). У 1970—73 старшыня праўлення Саюза архітэктараў Беларусі. Дзярж. прэмія Беларусі 1984 за ўдзел у планіроўцы і забудове Наваполацка.

Тв.: Архитектура Советской Белоруссии. М., 1973 (у сааўт.); Современные тенденции формирования территориальных систем расселения. Мн., 1981.

Літ.: Мастер — проверено «карандашом проектировщика» // Архитектура и стр-во. 2000. № 5.

ШПІТА́ЛЬ (ням. Spital ад лац. hospitalis гасцінны), 1) медыцынская ўстанова для стацыянарнага лячэння ваеннаслужачых (іх сем'яў), таксама для рабочых і служачых сілавых ведамстваў. Вылучаюць Ш. ваен., ваен.-марскія, авіяц., МУС, КДБ, пагранічных войск; рэсп., гал., гарнізонныя і інш. Ёсць Ш. для інвалідаў вайны. Адрозніваюць адна- і шматпрофільныя, стацыянарныя і рухомыя (у дзеючых войсках, напр., хірург. палявы рухомыя Ш.). Мае клінічныя аддзяленні (тэрапеўт., хірург. і інш.), у некат. — паліклінікі, лабараторыі і інш. У Ш. праводзіцца ўрачэбная экспертыза, навук. даследаванні і інш. 2) Установа для апекі над састарэлымі, бяздомнымі, беднымі і хворымі на Беларусі ў 15—18 ст. Засн. ў Брэсце (1495), Зэльве (1508), Мінску (1513) на ахвяраванні свецкіх феадалаў, каталіцкіх і пратэстанцкіх храмаў, кляштараў і інш. У 1-й пал. 17 ст. ў гарадах Беларусі было па некалькі Ш. (напр., у Мінску 5); у канцы 18 ст. на Беларусі было каля 370 шпіталяў. *І.М.Семяненя.*

ШПІТА́ЛЬНЫ Барыс Гаўрылавіч (7.8.1902, г. Растоў-на Доне, Расія — 6.2.1972), расійскі канструктар авіяц. стралкова-гарматнага ўзбраення. Д-р тэхн. н. (1940), праф. (1949). Герой Сац. Працы (1940). Скончыў Маскоўскі мех. ін-т (1927). З 1927 у Навук. аўтаматорным ін-це. У 1934—53 нач. і гал. канструктар асобнага канструктарскага бюро, потым праф. Маскоўскага ін-та інжынераў геадэзіі, аэрафотаздымкі і картаграфіі. У 1930 стварыў авіяц. кулямёт калібру 7,62 мм, у 1935 — 12,7 мм кулямёт, у 1936 — авіяц. гармату, што ўстанаўліваліся на розных тыпах самалётаў і танках Т-60. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1942.

Літ.: Сытин В.А. Изобретатель сверхпулемета. М., 1941.

ШПІ́ТЭЛЕР (Spitteler) Карл (24.4.1845, г. Лісталь, Швейцарыя — 29.12.1924), швейцарскі пісьменнік. Вывучаў права і тэалогію ва ун-тах Базеля, Цюрыха, Гайдэльберга. У 1871—79 жыў у Расіі. Пісаў на ням. мове. У эпічнай паэме ў прозе «Праметэй і Эпіметэй» (1880—81) перапляценне матываў ант. міфалогіі і новых касмалагічных ідэй. Абстрактна-алегарычны характар мае зб. эпічна-фантаст. паэм «Экстрамундан» (1883), пасля якога Ш. эвалюцыяніраваў у бок рэаліст.-псіхал. метаду (драмы «Парламенцёр», 1889; «Славалюб», 1892; навелы зб. «Фрыдлі-скандаліст», 1891; аповесці «Густаў. Ідылія», 1892; «Лейтэнант Конрад», 1898). Паэт. зб-кам «Матылькі» (1889) і «Балады» (1896) уласцівы памяркоўна-эксперым. характар. Гал. яго творы — вершаваны эпас «Алімпійская вясна» (1900—05, перапрацаванае выд. 1910), у якім тэма ўзаемаадносін мастака і ўлады, і сімвалісцкі раман «Імага» (1906). Аўтар прац па літ.-знаўстве, эстэтыцы, перапрацовак нар. балад, аўтабіягр. прозы і інш. Нобелеўская прэмія 1919.

Тв.: Рус. пер. — Избр. произв. // Хейзе П. Новеллы; Шпиттелер К. Избр. произв. М., 1999. *Л.П.Баршчэўскі.*

ШПІЦБЕ́РГЕН (Spitsbergen; стараж.-рус. назва Груманд, нарв. Свальбард), архіпелаг у зах. частцы Паўн. Ледавітага ак. Пл. каля 62 тыс. км^2. Буйныя а-вы: уласна Ш. (Заходні Ш.), Паўн.-Усх. Зямля, Эдж, Баранца. Берагі парэзаны фіёрдамі. Рэльеф горны (выш. да 1712 м, г. Ньютан). Больш за 35,1 тыс. км^2 паверхні ўкрыта ледавікамі, пашырана шматгадовая мерзлата. У расл. покрыве — імхі, лішайнікі, карлікавая бяроза і вярба. Нац. паркі — Паўн.-Зах. Шпіцберген, Форлан; некалькі рэзерватаў, у т.л. Паўн.-Усх. Свальбард. Радовішчы каменнага вугалю. Адм. цэнтр — Лонгйір, порт — Барэнцбург.

Адкрыты экспедыцыяй 1596—97 галандскага мараплаўца В.*Барэнца*. У 17 ст. Ш. — арэна барацьбы за кітабойныя промыслы паміж Галандыяй і Англіяй. У выніку сутыкненняў паміж іх прамысл. флатамі (1618) паўн. ч. ўзбярэжжа Ш. замацавана за галандцамі (засн. тут паселішча Смерэнбург), а паўд. — за англічанамі, французамі, ганзейскімі гарадамі і інш. У 1765 і 1766 на Ш. арганізавана рас. экспедыцыя пад камандаваннем адмірала В.Я.*Чычагова*. Доўгі час Ш. быў нічыйнай тэрыторыяй. У 1822 тут засн. 1-я нарв. зімоўка. Суверэнітэт Нарвегіі над Ш. устаноўлены міжнар. Парыжскім дагаворам 1920 (Шпіцбергенскі трактат; СССР далучыўся ў 1935), які адначасова аб'явіў Ш. нейтралізаванай тэрыторыяй. У 1925 Нарвегія афіцыйна абвясціла Ш. часткай Нарв. каралеўства.

ШПІЦБЕ́РГЕНСКАЕ ЦЯЧЭ́ННЕ, цёплае паверхневае цячэнне каля зах. берагоў *Шпіцбергена*, працяг Нарвежскага цячэння (сістэма *Гальфстрыма*). Т-ра вады 3—5 °С. Скорасць 0,9—1,8 км/гадз. Салёнасць каля 34,5‰. На Пн ад в-ва Зах. Шпіцберген паглыбляецца і дае пачатак патоку цёплых прамежкавых вод у Паўн. Ледавітым акіяне.

ШПІЦРУ́ТЭНЫ (ням., мн. л. Spiessruten), доўгія гнуткія палкі або дубцы для *цялесных пакаранняў* у еўрап. арміях. Уведзены ў 17 ст. ў Швецыі, потым у Прусіі. У Рас. імперыі выкарыстоўваліся ў 1701—1863 у арміі для пакарання ніжніх чыноў, а таксама цывільных асоб ніжняга саслоўя паводле прыгавору ваен. суда і паводле статута аб ссыльных. У 2-й пал. 19 ст. Ш. каралі ўдзельнікаў сял. хваляванняў і інш.

ШПІ́ЦЫ, група *дэкаратыўна-пакаёвых сабак*. Узніклі ў паўд. раёнах Германіі ад стараж. тарфяных сабак. Адрозніваюць Ш. воўчых, ці вольф-Ш. (выш. 43—55 см), сярэдніх (29—36 см), мініяцюрных (23—28 см) і карлікавых (да 22 см). Пашыраны ў свеце, на Беларусі гадуюць сабакаводы-аматары.

Канстытуцыя сухая, у карлікавых Ш. — далікатная. Моцны касцяк, сухая мускулатура. Галава невял., клінападобная. Вушы невял., стаячыя, трохвугольныя. На тулаве шэрсць доўгая і прамая, падшэрстак густы; на шыі доўгія валасы ўтвараюць грыву. Хвост пушысты, кальцом ляжыць на спіне. Афарбоўка аднародная шэрая, белая, рыжая, чорная, карычневая; двухколерная — у карлікавых Ш.

ШПІЯНА́Ж (ад ням. Spion шпіён ад spähen сачыць, падглядваць), злачынства супраць дзяржавы і парадку ажыццяўлення ўлады і кіравання. Паводле крымін. заканадаўства Рэспублікі Беларусь (арт. 358 КК) заключаецца ў перадачы, выкраданні, збіранні або захоўванні з мэтай перадачы замежнай дзяржаве, арг-цыі ці іх прадстаўнікам звестак, якія складаюць *дзяржаўную тайну*; перадачу ці збіранне па заданні замежнай разведкі інш. сакрэтных звестак для выкарыстання іх на шкоду інтарэсам краіны і грамадзянам Рэспублікі Беларусь, замежным грамадзянам або асобам без грамадзянства. Караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад 7 да 15 гадоў. Асоба, якая ўчыніла Ш., але добраахвотна спыніла сваю злачынную дзейнасць, паведаміла пра гэта дзярж. органам, аказала садзейнічанне ў прадухіленні шкодных вынікаў, вызваляецца ад крымін. адказнасці. Дзеючае заканадаўства Рэспублікі Беларусь, апрача аховы дзярж. тайны, змяшчае прававыя нормы, якія забяспечваюць ахову камерцыйнай і банкаўскай тайны (арт. 254 КК). Выкраданне або збіранне незаконным спосабам звестак пра такую тайну з мэтай яе выдавання або незаконнага выкарыстання таксама разглядаецца як крымін. злачынства і караецца ў адпаведнасці з законам.

Э.І.Кузьмянкова.

ШПО́НА (ад ням. Span трэска), 1) тонкія (да 5 мм) лісты драўніны (натуральная Ш.) ці інш. тэкстурнага матэрыялу (штучная Ш.). Натуральную атрымліваюць *лушчэннем* або *струганнем* камлёў, цурбакоў. Штучную вырабляюць з паперы з малюнкам тэкстуры драўніны і сінт. смол. Ш. выкарыстоўваюць у вытв-сці *фанеры, запалкавай вытворчасці*, для аблiцоўвання сталярных вырабаў, мэблі. 2) Друкарскі прагальны матэрыял у выглядзе метал. пласцінак для павелічэння прамежкаў паміж радкамі тэксту.

ШПОНАСТРУГА́ЛЬНЫ СТАНО́К, спецыялізаваны *дрэварэзальны станок* для атрымання *шпоны* метадам стругання загатовак. Загатоўка (ванчэс) — прамавугольны (у сячэнні) брус адпаведнай даўжыні, выраблены з камля, які апілоўваецца з чатырох бакоў і разразаецца ўздоўж на 2 роўныя часткі. Рэзальны інструмент (нож з прыціскной лінейкай) робіць зваротна-паступальны рух і пры кожным рабочым ходзе *супарта* зразае з ванчэсаў папярочныя стружкі (шпону) нязменнай таўшчыні. Ванчэсы падаюцца на таўшчыню шпоны пры дапамозе спец. механізма. Даўжыня нажа 3100—5500 мм, шырыня блока ванчэсаў 800—1200 мм, дыяпазон таўшчынь шпоны 0,025—6 мм. Ш.с. бывае верт. і гарыз. кампаноўкі.

ШПО́НАЧНАЕ ЗЛУЧЭ́ННЕ, злучэнне вала і надзетай на яго дэталі (зубчастага кола, шківа, муфты і інш.) з дапамогай шпонкі. Бываюць з зацяжнымі шпонкамі (пасаджаныя з нацягам), што перадаюць акружныя і восевыя намаганні, і з незацяжнымі шпонкамі (са свабоднай пасадкай), якія перадаюць толькі акружныя намаганні.



Шпоначнае злучэнне: а — з прызматычнай шпонкай; б — з сегментнай шпонкай; 1 — шпонка; 2 — ступіца.

ШПОР (Spohr) Людвіг (Луі; 5.4.1784, г. Браўншвайг, Германія — 22.10.1859), нямецкі кампазітар, скрыпач, дырыжор, педагог; адзін з заснавальнікаў нямецкай скрыпічнай школы. З 1813 капельмайстар т-ра «Ан дэр Він», дырэктар опернага т-ра ў г. Франкфурт-на-Майне, з 1847 генерал-музік-дырэктар у г. Касель. Гастраліраваў як скрыпач-віртуоз. Стваральнік адной з першых рамант. опер («Фауст» паводле Ф.Клінгера, паст. 1816). Сярод твораў: оперы (больш за 10), араторыі, 9 сімфоній (1811—50), 12 канцэртаў для скр. з арк., 34 скр. квартэты, камерна-інстр. ансамблі, фп. п'есы, песні (каля 100) і інш. Вынаходнік падбародніка для скрыпкі; адзін з першых увёў практыку дырыжыравання палачкай. Паўплываў на творчасць К.Вебера, Р.Вагнера. Аўтар «Скрыпічнай школы» (1833), «Аўтабіяграфіі» (т. 1—2, 1860—61).

ШПО́РА (ад ням. Sporn штуршок), сагнутая па форме абцаса метал. дужка з шыпам або кольцам (рапейкам), якая мацуецца да абутку вершніка для кіравання канём.

Вядома з 5 ст. да н.э. ў галаў (кельтаў), пазней у грэкаў і рымлян (на Стараж. Усходзе Ш. не было; у сярэднія вякі яе замяняла вастрыё на стрэмені). На тэр. Зах. Украіны, паўд. і сярэдняй Польшчы Ш. вядомы з даследаванняў археал. культур 1—2 ст. да н.э. Рабілі іх з жалеза, бронзы, серабра, часам з золата. У сярэднія вякі Ш. былі атрыбутам рыцарства, пазней пашыраны ў кавалерыі і коннай артылерыі. У арміі Рас. імперыі да 1917 Ш. ўваходзілі ў рыштунак афіцэраў, унтэр-афіцэраў і радавых, якім паводле роду службы належала ездзіць вярхом на кані (акрамя казакоў, якія замест Ш. карысталіся нагайкай). У Сав. Арміі (у кавалерыі і артылерыі на коннай цязе) Ш. выкарыстоўваліся да 1950-х г.

У наш час Ш. карыстаюцца наезнікі ў некат. відах коннага спорту.

ШПО́РА КАСЦЯВА́Я, шпора пятачная, шыпападобнае разрастанне касцявой тканкі на падэшвеннай паверхні пятачнай косці ў месцы прымацавання звязак ступні або пятачнага (ахілава) сухажылля. Бываюць пры *плоскаступнёвасці*, ад празмернай нагрузкі на нагу, пры частых траўмах у спартсменаў. Бачных запаленчых змен пры Ш.к. не бывае, але востры пякучы боль узнікае пры апоры на пяту. Лячэнне: фізія- і рэнтгенатэрапія, артапедычныя вусцілкі і абутак, зрэдку хірург. аперацыі.

ШПРО́ТЫ (Sprattus), род рыб сям. селядцовых. 6 відаў. Пашыраны ва ўмераных і субтрапічных водах каля берагоў Еўропы, Паўд. Амерыкі, Паўд. Аўстраліі і Новай Зеландыі. Найб. вядомы Ш. еў-

1

2

Да арт. **Шпора**: 1 — нармандскага рыцара. 11 ст.; 2 — знатнага рыцара. Канец 14 ст. (знойдзена ў Каталоніі, Іспанія).

рапейскі (S. sprattus) і 2 яго падвіды — балтыйскі, або кілька, і чарнаморскі.

Даўж. да 18 см. Цела сціснутае з бакоў, укрытае луской, якая лёгка спадае. Брушная кілявая луска добра развітая. Спіна сіняя або цёмна-блакітная, бакі і бруха серабрыстыя. Ніжняя сківіца выдаецца ўперад. Ікра пелагічная. Чародныя, планктонаедныя рыбы. Аб'екты промыслу. Іл. гл. да арт. *Кількі.*

ШПРУХ (ад ням. Spruch выказванне), жанр нямецкай сярэдневяковай паэзіі маральна-дыдактычнага зместу. Для яго характэрны парныя рыфмы з 4 націскамі ў кожным радку. Узнік у паэзіі *шпільманаў*, у 13—14 ст. шырока выкарыстоўваўся ў бюргерскай павучальнай л-ры. У ням. літ.-знаўстве з 19 ст. тэрмін «Ш.» абазначае таксама дыдактычныя жанры паэзіі *мінезінгераў*.

ШПРЫЦАВА́ННЕ ПАЛІМЕ́РАЎ, тое, што *экструзія*.

ШПРЭ, Шпрэе (Spree), рака ў Германіі, левы прыток р. Гафель (бас. р. Эльба). Даўж. 398 км, пл. бас. 10,1 тыс. км^2. Вытокі ў Судэтах, цячэ па Паўн.-Германскай нізіне. Веснавое разводдзе. Сярэдні расход вады каля 40 м^3/с. Суднаходная (ч. воднага шляху, што злучае Одэр і Эльбу). На Ш. гарады Берлін, Котбус.

ШПЭТ Язэп Геркуланавіч (23.2.1891, в. Зембін Барысаўскага р-на Мінскай вобл. — 21.1.1955), бел. пісьменнік. Пасля 1917 працаваў на Барысаўшчыне. З 1913 друкаваўся ў «Нашай ніве», змясціў больш за 20 апавяданняў, якія пераважна ўяўляюць сабой фрагменты-абразкі тагачаснага жыцця Барысаўшчыны і Лагойшчыны («Пажар», «У ноч перад святым Янам», «Выбары старшыні», «Адукаваная кабыла» і інш.), якім уласціва шчырасць, прастата, натуральнасць мовы. Запісваў фальклор. Допісы Ш. ў 1920-я г. друкаваліся ў газ. «Савецкая Беларусь», «Беларуская вёска», «Звязда» і інш.

Тв.: У кн.: Беларуская дакастрычніцкая проза. Мн., 1965.

Літ.: Каханоўскі Г. Язэп Шпэт // Каханоўскі Г. Адчыніся, таямніца часу. Мн., 1984. *Г.А.Каханоўскі.*

ШПЯНЁЎ Андрэй Андрэевіч (н. 28.2.1941, Душанбе), бел. піяніст, кампазітар. Засл. арт. Беларусі (1982). Скончыў Бел. кансерваторыю (1967). З 1968 артыст Сімф. аркестра Бел. тэлебачання і радыё. З 1987 піяніст і аранжыроўшчык Дзярж. аркестра сімф. і эстр. музыкі Беларусі пад кіраўніцтвам М.Фінберга. Стваральнік муз. перапрацовак твораў бел. кампазітараў-рамантыкаў 19 ст. Аўтар канцэрта для габоя і камернага арк., п'ес для эстр. арк., у т.л. фантазіі на тэмы твораў Я.Глебава, І.Лучанка, муз. кампазіцыі «Музычны партрэт Дж.Гершвіна», фп. ансамбляў на бел. нар. тэмы, аранжыровак песень бел. і замежных кампазітараў, у т.л. для бел. муз. фестываляў і конкурсаў, музыкі да дакументальных кінафільмаў і інш.

ШРА́ДЭР (Schrader) Ота (28.3.1855, г. Веймар, Германія — 21.3.1919), нямецкі мовазнавец і гісторык. Вучыўся ў Іене і Лейпцыгу. З 1890 праф. Іенскага, з 1909 — Брэслаўскага (Вроцлаўскага) ун-таў. Развіваў ідэі культ.-гіст. школы ў мовазнаўстве: параўноўваў даныя *параўнальна-гістарычнага мовазнаўства* з дасягненнямі археалогіі, этнаграфіі, батанікі, заалогіі. Комплексны культ.-гіст. падыход выкарыстоўваў і пры вывучэнні стараж. этн. гісторыі індаеўрап. народаў, пры рэканструкцыі сац. і культ. структуры першабытнага грамадства («Параўнальнае мовазнаўства і першабытная гісторыя», 1883; «Індаеўрапейцы», 1911). Стварыў «Слоўнік індаеўрапейскіх старажытнасцей» (1901).

«ШРАНЯ́ВА», прыватнаўласніцкі герб, якім карысталіся каля 120 родаў Бела-



Гэ́рб **«Шранява»**.

русі, Украіны, Літвы і Польшчы, у т.л. Квілецкія, Ліпскія, Любамірскія, Рагозы, Скіндары, Стадніцкія. У чырв. полі сярэбраная хвалістая стужка, на якой сярэбраны крыж. Клейнод — над прылбіцай з каронай галава льва паміж 2 турынымі рагамі са званочкамі. Вядомы з



Кулявая **шрапнель** у палёце і ў момант раскрыцця снарада: 1 — выбіўны зарад; 2 — дыяфрагма; 3 — кулі; 4 — корпус; 5 — цэнтральная трубка; 6 — дыстанцыйны ўзрывальнік; 7 — прышрубная галоўка.

канца 14 ст., у ВКЛ — пасля *Гарадзельскай уніі 1413.*

Э.Шродынгер.

ШРАПНЕ́ЛЬ, артылерыйскі снарад, корпус якога запоўнены паражальнымі элементамі (сферычныя кулі, стрыжні і інш.) для знішчэння адкрытай жывой сілы. Прапанавана ў 1803 англ. афіцэрам Г.Шрапнелем (адсюль назва). Снарад складаўся з дыяфрагмы, выбіўнога зарада з цэнтр. трубкай і дыстанцыйнага ўзрывальніка для разрыву ў зададзеным пункце траекторыі (над цэллю). Да 1-й сусв. вайны быў асн. снарадам палявой артылерыі. Страціў сваё значэнне ў пач. 1940-х г., калі на замену Ш. прыйшлі асколачныя і асколачна-фугасныя снарады. У канцы 1960-х г. з'явіліся артыл. снарады з гатовымі забойнымі элементамі — стрэлападобнымі стальнымі стрыжнямі (даўж. 25 мм і масай 0,5 г), аднак назва «Ш.» да іх не ўжываецца.

ШРО́ДЫНГЕР (Schrödinger) Эрвін (12.8.1887, Вена — 4.1.1961), аўстрыйскі фізік-тэарэтык, адзін са стваральнікаў *квантавай механікі.* Замежны ганаровы чл. АН СССР (1934). Скончыў Венскі ун-т (1910). У 1920—38 працаваў у розных ун-тах Еўропы. З 1941 дырэктар Ін-та вышэйшых даследаванняў у Дубліне, з 1956 праф. Венскага ун-та. Навук. працы па квантавай механіцы, матэм. фізіцы, тэорыі адноснасці, атамнай фізіцы і біяфізіцы. Распрацаваў хвалевую механіку, сфармуляваў яе асн. ўраўненне (гл. *Шродынгера ўраўненне*), увёў паняцце *хвалевай функцыі.* Даказаў эквівалентнасць хвалевай механікі і матрычнай квантавай механікі В.К.*Гайзенберга.* Нобелеўская прэмія 1933 (з П.А.М.*Дзіракам*).

Тв.: Рус. пер. — Новые пути в физике: Статьи и речи. М., 1971; Что такое жизнь. 2 изд. М., 1972; Избранные труды по квантовой механике. М., 1976.

Літ.: Льоцци М. История физики: Пер. с итал. М., 1970. С. 401—403; Клайн Б. В поисках: Физики и квантовая теория: Пер. с англ. М., 1971. С. 192—216.

А.І.Болсун.

ШРО́ДЫНГЕРА ЎРАЎНЕ́ННЕ, асноўнае дынамічнае ўраўненне нерэлятывісцкай *квантавай механікі.* Апісвае эвалюцыю ў часе *хвалевай функцыі* часціцы ці сістэмы часціц і матэматычна выражае *карпускулярна-хвалевы дуалізм* мікра-

аб'ектаў. Прапанавана Э.*Шродынгерам* у 1926.

Для часціцы масы m, якая рухаецца пад дзеяннем сілы і характарызуецца патэнцыяльнай энергіяй $V(x, y, z, t)$, у прамавугольных дэкартавых каардынатах Ш.ў. мае выгляд: $i\hbar\frac{\partial\psi}{\partial t} = -\frac{\hbar^2}{2m}\Delta\psi + V(x, y, z, t)\psi$, дзе i — уяўная адзінка, $\hbar = \frac{h}{2\pi}$, h — *Планка пастаянная*, $\Delta = \frac{\partial^2}{\partial x^2} + \frac{\partial^2}{\partial y^2} + \frac{\partial^2}{\partial z^2}$ — *Лапласа аператар*, $\psi = \psi(x, y, z, t)$ — хвалевая функцыя, t — час (гэтае ўраўненне наз. часавым Ш.ў.). Калі патэнцыял V не залежыць ад часу, то рашэнне Ш.ў. мае выгляд: $\psi(x, y, z, t) = e^{-(i/\hbar)Et}\varphi(x, y, z)$, дзе E — поўная энергія часціцы, хвалевая функцыя $\varphi(x, y, z)$ — рашэнне стацыянарнага Ш.ў.: $-\frac{\hbar^2}{2m}\Delta\varphi + V(x, y, z)\varphi = E\varphi$. У квантавай механіцы Ш.ў. адыгрывае такую ж ролю, як *Ньютана законы механікі* ў механіцы і *Максвела ўраўненні* ў электрадынаміцы. З дапамогай Ш.ў. тлумачацца, прадказваюцца і апісваюцца многія з'явы атамнай і ядз. фізікі, напр., узроўні энергіі атамаў, змены ў атамных спектрах пад уплывам эл. і магн. палёў, заканамернасці альфа-распаду, рассеянне нейтронаў на атамных ядрах.

А.І.Болсун.

Г.Ф.**Шродэр**.

ШРО́ДЭР (Schröder) Герхард Фрыц Курт (н. 7.4.1944, Мосенберг, цяпер у межах г. Бломберг, Германія), дзяржаўны і паліт. дзеяч Германіі. Юрыст. Вучыўся ў Гётынгенскім ун-це (1966—71). З 1963 чл. С.-д. партыі Германіі (СДПГ). У 1978—80 старшыня арг-цыі «Маладыя сацыялісты» ў складзе СДПГ. У 1980—86 і з 1998 дэп. бундэстага. З 1986 дэп. ландтага зямлі Ніжняя Саксонія, у 1986—90 старшыня фракцыі СДПГ у ім, з ліп. 1994 старшыня арг-цыі СДПГ у гэтай зямлі. З чэрв. 1990 прэм'ер-міністр Ніжняй Саксоніі. З кастр. 1998 федэральны канцлер ФРГ (ад СДПГ). Праводзіць прагматычны паліт. курс, скіраваны на мадэрнізацыю герм. дзяржавы. З крас. 1999 адначасова і старшыня СДПГ. Аўтар прац па палітталогіі.

Літ.: Орлов Б.С. Политический портрет Герхарда Шредера. М., 1999.

У.Я.Калаткоў.

ШРО́ДЭР (Schröder) Фрыдрых Людвіг (3.11.1744, г. Шверын, Германія — 3.9.1816), нямецкі акцёр, рэжысёр і тэатр. дзеяч. У 1771—98 (з перапынкамі) узначальваў Гамбургскі нац. т-р. Рэфарматар ням. сцэны. Сцвярджаў асветніцкі рэалізм і прагрэс. нац. рэпертуар. Заснавальнік тэатр. педагогікі і рэаліст. рэжысуры. Імкнуўся да ансамблевасці ў пастаноўках. Пераклаў і ўпершыню паставіў на гамбургскай сцэне трагедыі У.Шэкспіра. Найб. значныя ролі ў шэкспіраўскім рэпертуары: Гамлет, кароль Лір, Макбет, Атэла (у аднайм. п'есах). Выступаў і як драматург.

Літ.: История западноевропейского театра. Т. 2. М., 1957.

ШРО́ДЭР (Schröder) Эрнст (25.11.1841, г. Мангейм, Германія — 16.6.1902), нямецкі матэматык і логік. З 1876 праф. Вышэйшай школы ў г. Карлсруэ. Навук. працы па матэм. логіцы, тэорыі алгарытмаў. Даў сістэматычнае выкладанне алгебры логікі. Аўтар прынцыпу двайстасці і шэрагу інш. законаў матэм. логікі.

ШРОТ (ад ням. Schrot дробныя кавалкі, абрэзкі), канцэнтраваны бялковы корм, пабочны прадукт алейнай вытв-сці. Атрымліваюць пасля экстракцыі алею са здробненага насення алейных культур. Адрозніваюць Ш. сланечнікавы, рапсавы, соевы, бавоўнікавы, канапляны, гарчычны, клешчавінны і інш. Мае ў сабе пратэінаў 19—43%, тлушчаў 1—3%, вітаміны Е і групы В, шмат фосфару. Выкарыстоўваюць у складзе камбікармоў для адкорму буйн. раг. жывёлы, авечак, свіней, сажалкавых рыб. Некат. віды Ш. маюць ядавітыя ці наркатычныя рэчывы (рыцын у клешчавінным Ш., гасіпол у бавоўнікавым і інш.).

ШРОТ паляўнічы, дробныя металічныя (са свінцу з нязначным дабаўленнем сурмы і мыш'яку) шарыкі; састаўная частка патрона для стральбы з паляўнічага гладкаствольнага ружжа. Памеры Ш. ў большасці краін пазначаюцца ў міліметрах, радзей маюць літарнае абазначэнне. Робяць Ш. у шроталіцейных установах і спосабам штампоўкі; часам пакрываюць хромам, нікелем, меддзю.

ШРО́ТАВЫ ЭФЕ́КТ, невялікія хаатычныя адхіленні току электравакуумнай або паўправадніковай прылады ад яго сярэдняга значэння (гл. *Флуктуацыі электрычныя*). Выклікаецца нераўнамернасцю *тэрмаэлектроннай эмісіі* з катода або інжэкцыі носьбітаў зараду ў паўправадніках; суправаджае любыя працэсы, звязаныя з утварэннем патокаў зараджаных або нейтральных часціц, напр., *фотаэлектронную эмісію, другасную электронную эмісію*. Тэарэтычна прадказаны ням. вучоным В.Шоткі (1918). Абумоўлівае шумы ў эл. ланцугах, якія ў гукавым дыяпазоне частот нагадваюць шум ад перасыпання паляўнічага шроту (адсюль назва).

ШРО́ТАЎНІЦА, дробавая пушка, гармата нерэгулярнай артылерыі канца 16—18 ст. Выкарыстоўвалася, як правіла, у час абароны ўмацаванняў. Мела невял. даўжыню і малы калібр, страляла на кароткія адлегласці дробным метал. ці каменным *шротам* (адсюль назва). Гл. таксама *Цюфяк*.

ШРУБ Павел Міхайлавіч (н. 20.2.1955, в. Хільчыцы Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. паэт. Скончыў Ленінградскі ун-т (1977), Мінскую вышэйшую школу МУС Беларусі (1987). З 1977 працаваў у Наваполацкім політэхн. ін-це, у 1979—81 у Ін-це цепла- і масаабмену АН Беларусі. З 1983 выкладае ў каледжы МУС Беларусі. Друкуецца з 1979. У паэт. зб-ках «Лабараторыя» (1987), «Позні світанак» (1992), «Чорнабелы свет» (1995) і інш. кантрастнасць, супярэчлівасць жыцця, любоў да Радзімы, роднай мовы, адстойванне духоўных каштоўнасцей. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1988.

ШРУБЦЫ́НГА (ням. Schraubzwinge ад Schraube вінт + Zwinge ціскі), прыстасаванне для мацавання дэталей на варштаце, станку або ў шаблоне. Выкарыстоўваецца пры слясарнай, сталярнай і інш. відах апрацоўкі, пры склейванні дэталей, зборцы і г.д.



Шрубцынга: 1 і 2 — драўляная і металічная для сціскання ў адной плоскасці; 3 — для сціскання ў двух плоскасцях.

ШРЫ-ЛА́НКА, Дэмакратычная Сацыялістычная Рэспубліка Шры-Ланка, дзяржава ў Паўд. Азіі, на аднайм. востраве (б. Цэйлон), у Індыйскім акіяне. Ад Індыі аддзелена Манарскім зал. і Полкскім пралівам. Пл. 65,61 тыс. км². Нас. 19 576,8 тыс. чал. (2002). Афіц. мовы — сінгальская і тамільская; мова міжнац. зносін — англійская. Афіц. сталіца — Шры-Джаявардэнапура-Котэ (месцазнаходжанне парламента), фактычная — г. *Каломба*. Краіна падзяляецца на 8 правінцый. Нац. свята — Дзень незалежнасці (4 лютага).

Дзяржаўны лад. Прэзідэнцкая рэспубліка. Кіраўнік дзяржавы — прэзідэнт. Выканаўчую ўладу ажыццяўляюць прэзідэнт і прэм'ер-міністр, які ўзначальвае Савет Міністраў. Заканад. ўлада належыць аднапалатнаму парламенту — Нац. дзярж. асамблеі, дэпутаты якой выбіраюцца на 6 гадоў. Выбарчым правам карыстаюцца ўсе грамадзяне з 18 гадоў. Суд. сістэма ўключае Вярх. суд, які з'яўляецца таксама апеляцыйнай інстанцыяй, суды акруговыя, магістратаў і

сельскія. Суддзяў прызначае ўрад, членаў Вярх. суда — прэзідэнт.

Прырода. Большая ч. краіны — узгорыстыя раўніны. На Пд і ў цэнтры сталовыя горы з пераважнымі выш. 1000—2000 м (найб. 2524 м, г. Підуруталагала). Карысныя выкапні: графіт, вапнякі, паўкаштоўныя і каштоўныя камяні (рубіны, сапфіры, тапазы, турмаліны, аметысты), фасфарыты; на ПнУ і ПдУ узбярэжжа — чорныя пяскі з рэдкімі і рэдказямельнымі элементамі (ільменіт, манацыт, цырконій, рутыл, радый); разнастайныя буд. матэрыялы (граніты, гнейсы, латэрыты). Клімат субэкватарыяльны, на Пд экватарыяльны. Сярэднямесячная т-ра на раўнінах каля 27 °С, у гарах 23—25 °С. Адно з самых халодных месцаў — горны курорт Нувара-Элія (2000 м над узр. м.) з сярэднегадавой т-рай 15 °С. Колькасць ападкаў за год павялічваецца з ПнУ на ПдЗ з 1300—2000 мм да 2500—3000 мм. Рачная сетка густая. Рэкі кароткія, найб. — Махавелі (330 км). Глебы чырвона-бурыя і чырвона-жоўтыя фералітныя, у далінах рэк — алювіяльныя. Больш за 70% тэр. ўкрыта натуральным раслінным покрывам. На Пд — участкі вечназялёных трапічных лясоў, на ПнУ трапічныя лістападныя лясы. Жывёльны свет разнастайны: сланы, леапарды, рысі, гепарды, шакалы, мядзведзі, шмат малпаў, ядавітых змей, яшчарак, у рэках — кракадзілы. Нац. паркі: Васгамува, Вілпату, Гал-Оя, Кумана, Мадуру-Оя, Уда-Валаве, Яла (Рухуна).

Насельніцтва. Асн. насельніцтва — сінгалы (74%) і тамілы (18%). Жывуць таксама маўры (нашчадкі арабаў і мясц. мусульман) — 7%, бюргеры (нашчадкі галандцаў і партугальцаў), малайцы, веды, кафіры (афрыканцы), ланкійскія цыганы. Сярод вернікаў пераважаюць будысты (70%) і індуісты (15%). Ёсць хрысціяне (католікі) — 8%, мусульмане — 7% (1999). Натуральны прырост 0,85% (2002). Сярэдняя шчыльн. 298 чал. на 1 км^2. Найб. шчыльна заселены ПдЗ вострава. У акрузе Каломба шчыльн. больш за 2 тыс. чал. на 1 км^2. У гарадах жыве 23% насельніцтва. Буйныя гарады (тыс. ж., 1993): Каломба — 2026 (з прыгарадамі), Маўнт-Лавінія — 175, Моратува — 135, Джафна — 125. Працаздольнага насельніцтва 6,6 млн. чал. (1998). У прам-сці занята 17% эканамічна актыўнага насельніцтва, у сельскай гаспадарцы — 38%, у сферы паслуг — 45%.

Гісторыя. З часоў палеаліту Ш.-Л. насялялі плямёны паляўнічых-збіральнікаў, ад якіх, відаць, пайшоў сучасны народ *веды*. У 6—3 ст. да н.э. востраў засялілі інда-арыйскія плямёны з Паўн. Індыі. Яны назвалі краіну Сінхаладвіпа (санскр. — «краіна львоў»), у скажонай транскрыпцыі Сілон (рус. і бел. Цэйлон), а сябе — сінгаламі. Адначасова ўжывалася і другая назва вострава — Ланка (благаслаўёная, цудоўная зямля). У 3 ст. н.э. склалася Сінгальская дзяржава (сталіцы — гарады Анурадхапура, Паланарува), дзе дзярж. рэлігіяй стаў *будызм*. Яна з пераменным поспехам



Герб і сцяг **Шры-Ланкі**.

ваявала з прышэльцамі з Паўд. Індыі таміламі і ў 15 ст. распалася. На Пн вострава ўзнікла Тамільская дзяржава са сталіцай у г. Джафна. З 1505 да пач. 17 ст. прыбярэжныя раёны Ш.-Л. заваяваны партугальцамі, але яны не здолелі зламаць супраціўленне сінгальскага каралеўства з цэнтрам у г. Канды, якое з 15 ст. існавала ў горнай частцы вострава. У 1658 галандцы з дапамогай кандыйцаў выгналі партугальцаў, але ў 1795—96 самі былі выгнаны англічанамі. З 1802 Ш.-Л. —асобная брыт. калонія Цэйлон, у 1815 англічане захапілі і Кандыйскае каралеўства. У 1833 пры брыт. губернатару створаны Заканад. савет, у 1912 прынята канстытуцыя. Паводле канстытуцыі 1931 уведзена ўсеагульнае выбарчае права. 4.2.1948 абвешчана незалежнасць Ш.-Л. ў складзе брыт. *Садружнасці*. Паводле канстытуцыі 1972 Ш.-Л. — рэспубліка. У краіне дзейнічаюць каля 30 паліт. партый, але ўвесь перыяд незалежнасці ўлада папераменна належыць або правай Аб'яднанай нац. партыі (засн. ў 1946, правіла ў

1948—56, 1960, 1964—70, 1977—94), або левай Партыі свабоды Ш.-Л. (засн. ў 1951, правіла ў 1956—60, 1960—64, 1970—77 і са жн. 1994 у складзе Нар. альянсу). З 1994 прэм'ер-міністр Ш.-Л. — С.*Бандаранаіке*, прэзідэнт — яе дачка Ч.Кумаратунге. Становішча ў краіне ўскладнена ўзбр. канфліктам (з 1983) паміж урадам і арг-цыяй Тыгры вызвалення Таміл Ілама, якая тэрарыст. метадамі змагаецца за стварэнне на Пн і ПнУ вострава незалежнай Тамільскай дзяржавы. Ш.-Л. — чл. ААН (з 1955),

Да арт. **Шры-Ланка**. У наваколлі горада Канды.

Руху недалучэння (з 1961), інш. міжнар. арг-цый. Дыпламат. адносіны з Рэспублікай Беларусь устаноўлены ў ліст. 2000.

Гаспадарка. Ш.-Л. — агр.-індустр. краіна з развітой плантацыйнай гаспадаркай. З 1970-х г. у краіне праводзяцца рыначныя рэформы, што спрыяе пашырэнню аб'ёму інвестыцый у эканоміку (у 1997 — 550 млн. дол.), хуткаму развіццю прам-сці і сферы паслуг. Асн. інвестары — Японія, Паўд. Карэя, Сінгапур, мадэлі эканам. развіцця якіх Ш.-Л. прыстасоўвае да сваіх умоў. Валавы ўнутр. прадукт (ВУП) у 2001 склаў 62,7 млрд. дол. (3,25 тыс. дол. на 1 чал.). Штогадовы рост ВУП у 1997—2000 — 5,3%. У сельскай гаспадарцы ствараецца 21% ВУП, у прам-сці — 27%, у сферы паслуг — 52%. Гал. галіна сельскай гаспадаркі — земляробства, якое пашырана пераважна на ПдЗ востраў, дзе няма патрэбы ў арашэнні. Апрацоўваецца 14% тэр. Гал. плантацыйныя культуры — чай (збор больш за 240 тыс. т штогод), гевея (100 тыс. т натуральнага каўчуку), какосавая пальма (60 тыс. т копры), займаюць 2/3 пл. зямель, што апрацоўваюцца. З інш. плантацыйных культур вырошчваюць вострапрыпраўныя расліны (перац, кардамон, мускатны арэх, карыца, гваздзіка і інш.), какава, ананасы, цукр. трыснёг, тытунь. У канцы 20 ст. роля плантацыйнай гаспадаркі ў экспартных паступленнях значна знізілася (з 90% у 1970 да 20% у 2000). Гал. харч. культура — рыс (2,76 млн. т, 2000), пашырана паўсюдна, асабліва на алювіяльных глебах у далінах рэк і на прыморскіх нізінах. Кліматычныя ўмовы дазваляюць збіраць па 2—3 ураджаі за год. У больш засушлівых раёнах вырошчваюць проса (491 тыс. т, 2000), кукурузу (315 тыс. т), сорга (140 тыс. т), бабовыя, батат, маніёк, агародніну. Жывёлагадоўля развіта слаба. Пагалоўе (млн. галоў, 2001): буйн. раг. жывёлы — 1,56, коз — 0,5, птушак — 11, свіней — 0,07, авечак — 0,01. Буйн. раг. жывёла выкарыстоўваецца як цяглавая сіла. Улоў рыбы (1999) 247 тыс. т. У прамысловасці найб. інтэнсіўна развіваюцца тэкст. і швейная галіны. У 5 зонах свабоднага гандлю працуюць больш за 150 прадпрыемстваў па вытв-сці тэкст. вырабаў на экспарт. Развіты традыц. галіны — чайная, перапрацоўка какосавых арэхаў (алей, мыла, гліцэрын, кандытарскія вырабы, алкагольныя напіткі і інш.), цукр., тытунёвая, мукамольная, гарбарна-абутковая. Ёсць прадпрыемствы чорнай металургіі (Орувела), маш.-буд. (пераважна зборачныя, па вытв-сці абсталявання для лёгкай прам-сці і інш.), нафтаперапр., гумавай (шынны з-д у Келані), фарфоравай, цэм. прам-сці. 50% прамысл. прадпрыемстваў сканцэнтравана ў г. Каломба і яго прадмесцях. Выпрацоўка электраэнергіі 6,6 млрд. кВт·гадз (2000) на ГЭС (68%) і ЦЭС (32%). Здабыча графіту, каштоўных і паўкаштоўных камянёў, солі. Вял. значэнне маюць маст. промыслы — разьба па дрэве, рогу, чарапахавых пласцінах, слановай косці, чаканка па метале, вытв-сць упрыгожанняў з каштоўных камянёў. Асн. від транспарту — аўтамабільны. Даўж. аўтадарог больш за 25 тыс. км, у т.л. з цвёрдым пакрыццём 11,3 тыс. км. У краіне 220 тыс. легкавых і 249 тыс. грузавых аўтамабіляў і аўтобусаў. Чыгункі (даўж. 1463 км) пераважна аднакалейныя. Унутр. водных шляхоў — 430 км, трубаправодаў — 62 км. Гал. марскія парты: Каломба, Галле, Джафна, Трынкамалі. 15 аэрапортаў, у т.л. міжнар. ў Каломба. Экспарт (4,9 млрд. дол., 2001) тканін, швейных і гумава-тэхн. вырабаў, чаю, каштоўных камянёў, прадуктаў какосавай пальмы. Імпарт (6 млрд. дол., 2001) машын і абсталявання, паліва, харч. прадуктаў. Асн. гандл. партнёры: ЗША, Вялікабрытанія, Японія, Індыя. Штогод краіну наведваюць каля 500 тыс. замежных турыстаў. Даход ад турызму 275 млн. дол. (1998). Грашовая адзінка — рупія Ш.-Л.

Да арт. **Шры-Ланка**. Размалёўка на скале. Сігірыя. 5 ст.

Да арт. **Шры-Ланка**. Размалёўка пячорнага храма ў Дамбуле. 18 ст.

Да арт. **Шры-Ланка**. Скульптурнае аздабленне круглага храма Вата-да-ге ў г. Паланарува. 12 ст.

Архітэктура і выяўленчае мастацтва. Вял. ўплыў на стараж. мастацтва Ш.-Л. (3 ст. да н.э. — 8 ст. н.э.) зрабіла культура Індыі. У аснове планіроўкі стараж. гарадоў быў падзел на Унутр. (т.зв. Царскі) горад, умацаваны сценамі, з палацам і гал. культавымі пабудовамі, і Знешні горад з жылымі кварталамі, манастырамі, прадмесцямі (Анурадхапура). Самы вял. арх. комплекс горада — будыйскі манастыр (віхара) — пераўзыходзіў інда-будыйскія ўзоры па памерах, разнастайнасці тыпаў пабудоў: ступа (дагоба), дамы дрэва Бодхі, астанкаў, рэліквій і інш. Найб. даўнія арх. помнікі: звонападобныя ступы Тхупарама (3 ст. да н.э.), Руанвелі (2—1 ст. да н.э.), скальны манастыр Ісурумунія (5—8 ст. н.э.), палацы, штучныя вадаёмы ў г. Анурадхапуры; рэшткі палацавых будынкаў, ступы Даміла-тхупа, Ранкатвіхара-ступа, Кірывіхара, круглы храм Вата-да-ге, дом вобраза Ланкатылака, пячорны комплекс Галвіхара і інш. ў г. Паланарува. Для будыйскай каменнай пластыкі характэрны манументальнасць, стрыманасць вобразаў, лаканізм форм: гарэльеф «Закаханыя» ў Анурадхапуры (5 ст.), гіганцкія скальныя статуі Буды і Ананды ў Паланаруве (12 ст.). З 11 ст. ўзводзілі індуісцкія храмы (Шыва

Дэвале № 1 і № 2 у Паланаруве). Выяўл. мастацтва звязана з інд. маст. школамі. У 5 ст. на скале Сігірыя створаны размалёўкі (мяркуюць, што першапачаткова іх было 500; захавалася 21) з выявамі фігур знатных жанчын у выглядзе паўбожаствaў апсар, якія скрозь воблакі кідаюць на зямлю кветкі. З 16 ст. пашырыліся еўрап. ўплывы. Традыцыі нац. архітэктуры захоўваліся ў г. Канды [храм Зуба Буды (Далада Малігава), 14, 18—19 ст.], мастацтва — у Дамбуле (размалёўка пячорнага храма, 18 ст.). У 1-й пал. 19 ст. пераважалі формы англ. класіцызму, станковае мастацтва развівалася ў духу англ. акадэмізму. У 1888 прадстаўнікі традыц. кірунку ў мастацтве аб'ядналіся ў «Цэйлонскае таварыства мастацтва». У 1-й пал. 20 ст. ў сувязі з нац.-вызв. рухам склалася маст. аб'яднанне «Група 43», прадстаўнікі якога Х.Піерыс, Дж.Кіт, Дж.Дэраніягала і інш. спалучалі нар. і міфалагічныя сюжэты з прыёмамі еўрап. мастацтва. Члены «Таварыства нацыянальнага мастацтва» (1950, арганізатар будыйскі вучоны-манах Мапалагама Віпуласара тхера) у сваіх творах адраджалі традыцыі сярэдневяковага сценапісу (Б.Л.А.Мендыс, К.С.Віджая і інш.). Развіваюцца стараж. віды маст. рамяства: ткацтва, разьба па дрэве (арх. дэталі, маскі), апрацоўка металу (насечка, чаканка) і каштоўных камянёў, вытанчаная разьба па слановай косці, выраб лакавых рэчаў. У буд-ве выкарыстоўваюцца дасягненні сусв. дойлідства і вопыт нац. архітэктуры. Помнікі гарадоў Анурадхапура, Паланарува, Сігірыя, Канды ўключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.

Літ.: Талмуд Э.Д. История Цейлона, 1795—1965. М., 1973; Республика Шри Ланка: История и современность. М., 1977; Страны и народы: [Зарубежная Азия. Южная Азия]. М., 1982; Тюляев С.И., Бонгард-Левин Г.М. Искусство Шри Ланка. М., 1974.

У.М.Зайцаў (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *В.У.Адзярыха* (гісторыя), *Я.Ф.Шунейка* (архітэктура і выяўленчае мастацтва).

ШРЫЎПАРТ (Shreveport), горад на Пд ЗША, на р. Рэд-Рывер, штат Луізіяна. Засн. ў 1837. 200 тыс. ж. (2000); з прыгарадамі 392 тыс. ж. Буйны цэнтр нафта- і газаздабычы, гандл.-трансп. цэнтр раёна баваўнаводства. Прам-сць: эл.- тэхн. і радыёэлектронная, у т.л. вытв-сць трансфарматараў, сродкаў сувязі, тэлефонных апаратаў, баваўняная, нафтаперапр., хімічная. Ун-т.

ШРЫ́ФЕР (Schrieffer) Джон Роберт (н. 31.5.1931, г. Ок-Парк, ЗША), амерыканскі фізік. Чл. Нац. АН ЗША (1971), Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1970). Замежны чл. Рас. АН (1988). Скончыў Масачусецкі тэхнал. ін-т (1953) і Ілінойскі ун-т (1957). З 1961 у Пенсільванскім ун-це (з 1962 праф.), з 1980 у Каліфарнійскім ун-це ў г. Санта-Барбара. З 1992 ва ун-це штата Фларыда і Нац. лабараторыі моцных магнітных палёў. У 1994—96 прэзідэнт Амер. фіз. т-ва. Навук. працы па фізіцы кандэнсаваных асяроддзяў, фізіцы нізкіх т-р, тэорыі многіх цел, звышправоднасці, магнетызме. Стварыў паслядоўную мікраскапічную тэорыю звышправоднасці [з Дж.*Бардзінам* (гл. Дадатак) і Л.*Куперам*; тэорыя Бардзіна—Купера—Ш., ці БКШ-тэорыя; 1957]. Нобелеўская прэмія 1972 (з Бардзінам і Куперам).

Тв.: Рус. пер. — Новое в изучении сверхпроводимости. М., 1962 (разам з Дж.Бардзінам); Теория сверхпроводимости. М., 1970; Сверхпроводимость полупроводников и переходных металлов. М., 1972 (у саўт.).

М.М.Касцюковіч.

Дж.Р.**Шрыфер**.

ШРЫФТ (ням. Schrift ад schreiben пісаць), графічная сістэма літар, лічбаў і інш. моўных знакаў, форма якіх падпарадкавана функцыянальным, мастацкім або тэхнічным патрабаванням. Базіс усякага графічнага моўнага знака — *графема*, па якой вызначаюцца *літары*. Ш. з'яўляецца графічнай інтэрпрэтацыяй алфавітнага ладу. На форму Ш. прама ці ўскосна ўздзейнічаюць розныя фактары: традыцыі, мова, інфарм. патрэба, тэхн. сродкі, культ. ўзровень, індывід. асаблівасці стваральніка. У вузкім сэнсе Ш. — камплект друкарскіх літар, прызначаны для *набору* ў паліграфіі (наз. *гарнітура*). Тэрмін «Ш.» з'яўляецца з пачаткам кнігадрукавання. Усх. славяне карыстаюцца ім з пач. 18 ст., да гэтага часу друкарскія і рукапісныя *алфавіты* наз. *азбукай*.

Грэч. і этрускі алфавіты сталі крыніцай *лацінскага пісьма*. Найб. дасканалы Ш. прапісных манум. літар надпісаў вядомы з 2 ст. н.э. (надпіс на калоне Траяна ў Рыме, 114). Сярод розных народаў свету пашыралася пісьмо капітальнае (5 ст.), унцыяльнае (6 ст.), мінускульнае (з канца 8 ст.). У сярэднія вякі склаўся гатычны Ш. (тэкстура, фактура, ратонда, швабах); у эпоху Адраджэння — гуманіст. антыква (стараж., пераходная, новая, пазней егіп., італійская, гратэск, мадэрн), якія сталі асновай цяперашніх друкарскіх лац. Ш. Развіццё друкарскіх Ш. на аснове *кірыліцы* (канец 15 — пач. 18 ст.) адбывалася пад уздзеяннем рукапісных кірыліцкіх азбук *уставa, паўуставa, вязі*, грамадз. пісьма, *скорапісу* і друкарскіх Ш. Зах. Еўропы.

Бел. Ш., як і *пісьмо* ў цэлым, бярэ пачатак ад рунічных знакаў (гл. *Рунічнае пісьмо*). З прыняццем хрысціянства царк. кнігі перапісваліся ўстаўнымі (кірыліцкімі) літарамі (магчыма, і *глаголіцай*). Кнігі 11 ст., напісаныя ў розных месцах, маюць пэўную адметнасць. Напр., для *Тураўскага евангелля* характэрны аптымальная мера суадносін прасторы і графікі, амаль абсалютная рытмічная правільнасць, яснасць і ўстойлівасць літар, нетаропкае пісьмо з вял. густам.



1-3 4 5



6



7 8 9 10

Шрыфты: 1—3 — друкарскія Ф.Скарыны. 1517—19; 4 — графічнае супастаўленне літар «В» — сучаснай і з «Бібліі» Ф.Скарыны; 5 — друкарскі П.Мсціслаўца. 1575; 6 — фрагмент Статута ВКЛ 1588; 7 — графічныя асаблівасці сучасных друкарскіх шрыфтоў; 8 — графічная пабудова лацінскай літары, выкананая Леанарда да Вінчы; 9 — тытульны ліст Брэсцкай бібліі. 1563; 10 — сучасны шрыфт, выкананы паводле друкарскага набornага шрыфту Ф.Скарыны (аўтар Г.Мацур. 1985).

Графічны строй *Астраміра ева нгелля* прынята лічыць эталонам. У 14 ст. пашырылася новая графіка літар — паўустаў, вязь, скорапіс, што значна паскарала працэс пісання. Гіст. з'ява пач. 16 ст. — шрыфты Ф.Скарыны (ініцыяльныя, тытульныя, тэкставыя). Скарына ўжо ў першым сваім выданні прыстасаваў зах.-рус. літары да друкарскага набору. Выдадзены ім «Псалтыр» (Прага, 1517) вызначаўся гармоніяй выяў, арнаменту і тэкставага матэрыялу, роўнай тонавай насычанасцю старонак, багатай разнастайнасцю форм і аздаблення *ініцыялаў*, што мела вял. значэнне для семантычнай сувязі тэксту і ілюстрацый. У 2-й пал. 16 ст. працу над Ш. прадоўжылі С.Будны і В.Цяпінскі. На тэр. ВКЛ Ш., падобнымі на рукапісныя, друкавалі кнігі Мамоніч ы (гл. *Мамонічаў друкарня*). Высокімі графічнымі якасцямі вызначаліся Ш., створаныя на аснове ўстава і паўустава П.Мсціслаўцам. Іх капіравалі і выкарыстоўвалі інш. друкарні. У графіцы літар Статута ВКЛ (1588) своеасабліва ўвасоблена спалучэнне бел. скорапісу, друкарскай тэхналогіі са зручнасцю чытання, што надае Ш. вял. арыгінальнасць. Высокае майстэрства выкарыстання Ш. праявілася ў кнігах для навучання: павялічаныя памеры і высокая яснасць літар, ужыванне арнаментыкі вылучаюць кнігі Л.Зізанія «Азбука» і «Граматыка славенска» (1596), «Буквар» М.Сматрыцкага (1618) і інш. Пашырэнне мелі і лац. Ш. (польская графіка, ці т.зв. лацінка), якімі друкавалі свецкія і рэліг. кнігі (*Брэсцкая біблія*); яны існавалі да пач. 20 ст. На развіццё бел. Ш. (рукапісных і друкарскіх) у розныя часы ў пэўнай ступені ўплывалі памежныя культуры Захаду і Усходу. Рэформа пісьма 1708 у Расіі (у выніку устаў, паўустаў і вязь ужываліся толькі для царк. л-ры, новая спрошчаная графіка Ш. — т.зв. *грамадзянскі шрыфт* — для свецкіх патрэб), далучэнне бел. зямель да Расіі ў выніку падзелу Рэчы Паспалітай 18 ст. адбіліся на графічных сродках пісьма. З 19 ст. вяліся пошукі форм Ш., ствараліся і шырока выкарыстоўваліся новыя Ш. (егіп., італьян., дэкар.) пад уплывам стыляў класіцызму, мадэрну. У пач. 20 ст. пачалося друкаванне легальных выданняў на бел. мове рускім грамадз. Ш. са сваёй арфаграфічнай асаблівасцю (творы М.Багдановіча, Я.Купалы, Я.Коласа і інш.). У наш час у галіне шрыфтавой справы працуюць навукоўцы, пісьменнікі, мастакі (Ю.Бокая, У.Лукашык, Г.Мацур, Р.Найдзін, П.Семчанка). Ёсць значныя дасягненні ў шрыфтавым афармленні кніг, спроба стварыць бел. нац. друкарскі Ш. У 1972 у Бел. АМ створаны курс маст. Ш. (заснавальнік Семчанка). У 1994 арганізавана суполка «Літарт», якая сістэматычна праводзіць выставы Ш. і каліграфіі, выдае манаграфіі.

Літ.: Ботвинник М: Откуда есть пошел букварь. Мн., 1983; Карскі Я. Беларусы. Мн., 2001; Кликушин Г. Шрифты. 2 изд. Мн., 1984; Нікалаеў М. Палата кнігапісная. Мн., 1993; Павленко Н. История письма. 2 изд. Мн., 1987; Семченко П. Основы шрифтовой графики. Мн., 1978; Шматов В. Искусство книги. М., 1990; Дюрер А. Трактат о шрифте: Пер. с нем. М., 1981; Тоотс В. Современный шрифт. М., 1966; Большаков М., Гречихо Г., Шицгал А. Книжный шрифт. М., 1964; Шицгал А.Г. Русский типографский шрифт. 2 изд. М., 1985; Різник М.Г. Письмо і шрифт. Київ, 1978; Карт А. Schrift und Buchkunst. Leipzig, 1982. *П.А.Семчанка.*

Шрыфты: 1 — антыква эпохі Адраджэння; 2 — сучасны (аўтар П.Семчанка).

ШРЫФТ друкарскі, камплект друкавальных *літар*, неабходных для ўзнаўлення пэўнага *алфавіту*, лічбаў і знакаў. Ш. адрозніваюць паводле абрысу літар (прамы, нахілены, *курсіў*), іх шырыні (нармальны, вузкі, шырокі), насычанасці (светлы, паўтлусты, тлусты), рысунка (гл. *Гарнітура*), памераў (вызначаецца *кеглем*). Выкарыстоўваецца ў наборнай вытв-сці (гл. *Наборныя працэсы*).

Наборны Ш. падзяляецца на металічны (літары або радкі тэксту адліты са спец. сплаву — гарту, бывае літара- ці радковаадліўны) і неметал. (фотанаборны, у выглядзе негатыўных або пазітыўных выяў, і дыгітальны, запісаны ў памяці ЭВМ у выглядзе лічбавых даных), тэкставы (для набору тэкстаў), тытульны (для набору загалоўкаў, тытульных лістоў, вокладак), акцыдэнтны (для набору малых друкарскіх форм — атэстатаў, дыпломаў, бланкаў), афішна-плакатны. На Беларусі Ш. падзяляюцца па гал. графічных адзнаках (кантрастнасці, наяўнасці і формах засечак) на 6 асноўных і 1 дадатковую групу, а ўнутры кожнай групы — на аднолькавыя па характары рысунка гарнітуры (напр., літаратурную, акадэмічную). Памеры Ш. — ад кегля, роўнага 4 *пунктам* (каля 1,5 мм), да буйных (афішных) Ш., кегль якіх роўны 15 *квадратам* (каля 270 мм). Ш. адліваюць на шрыфталіцейных машынах і аўтаматах, захоўваюць у наборных касах.

Першыя друкарскія Ш. створаны на аснове рукапісных (напр., славянарускі — на аснове *паўустава*). На аснове ўведзенага ў Расіі ў 1708 *грамадзянскага шрыфту* сфарміраваліся сучасны рус. Ш., бел. і ўкр. алфавітныя сістэмы. У падрыхтоўцы ўзораў Ш. прымаў удзел бел. асветнік І.Ф.*Капіевіч*.

Літ.: Справочник технолога-полиграфиста. Ч. 1. Наборные процессы. М., 1981; Шицгал А.Г. Русский типографский шрифт. 2 изд. М., 1985; Владимиров Л.И. Всеобщая история книги. М., 1988. *У.М.Сацута.*

ШРЭ́ТЭР (Schroetter, Szretter, Schretter) Іаган (?— да 20.2.1685), жывапісец ням. паходжання. Творчасць звязана з маст. жыццём Беларусі, Польшчы і Літвы. Жыў у Гданьску, у 1640-я — пач. 1650-х г. у Гродне і Вільні, з 1655 у Кёнігсбергу, з 1660-х г. зноў у Вільні. Быў чл. брацтва св. Марціна. У 1646 стварыў для Гродзенскага касцёла брыгітак алтарныя карціны: «Дабравешчанне», «Святая Брыгіта», «Святая Ганна», «Нявіннае зачацце Дзевы Марыі» і інш. У 1646 у Вільні напісаў партрэт жонак Януша Радзівіла — Катажыны Патоцкай і Марыі Лупу. Яму прыпісваюць партрэт Хрысціны Яўхіміі Радзівіл (да 1657). Большасць яго работ не захавалася, у

Элементы і параметры **шрыфту**: 1 — міжлітарны прасвет; 2 — унутрылітарны прасвет; 3 — лінія круглявых літар; 4 — лінія шрыфту; 5 — вышыня прамых вялікіх літар; 6 — засечкі; 7 — злучальныя штрыхі; 8 — асноўныя штрыхі; 9 — надлітарны значок; 10 — выступаючыя элементы; 11 — аднабаковая засечка; 12 — кропка; 13 — вышыня круглявых малых літар; 14 — падлітарны значок; 15 — звіслыя элементы; 16 — вышыня малых літар; 17 — вертыкальная засечка.



Шрыфты друкарскія: а — светлы; б — паўтлусты; в — тлусты; 1 — прамы нармальны; 2 — прамы вузкі; 3 — прамы шырокі; 4 — курсіўны нармальны; 5 — нахілены нармальны.

т.л. для брацтва св. Марціна, алтарная карціна «Казьма і Дзям'ян» для касцёла св. Іаана ў Вільні.

Літ.: Jodkowski J. Nieznane prace J.Szrettera i F.Lekszyckiego // Biuletyn historii sztuki. 1948. № 1; Kamieniecka E. Portrety Jana Szrettera // Rocznik Muzeum Narodowego w Warszawie. Warszawa, 1973. T. 17; Paknys M. Vilniaus tapytoją padėtis XVII a. II puseje // Menotyra. 1999. № 4; Kałamajska-Saeed M.Kościół brygitek w Grodnie // Sztuka ziem wschodnich Rzeczypospolitej XVI—XVIII w. Lublin, 2000.

А.Лугаваене.

І.**Шрэтэр.** Партрэт Катажыны і Марыі Радзівіл. 1646.

ШТАБ (ням. Stab), асноўны орган кіравання войскамі, іх баявой і паўсядзённай дзейнасцю ва ўсіх звёнах ад батальёна (дывізіёна) і вышэй. Ш. існуюць ва ўзбр. сілах усіх краін, у т.л. ў Рэспубліцы Беларусь. Ш. відаў узбр. сіл наз. галоўнымі, а Ш. усіх узбр. сіл — генеральным. У залежнасці ад ваен. дактрыны дзяржавы сістэма Ш. можа мець розныя назвы, колькасны склад і інш. Асн. задачы Ш.: забеспячэнне баявой і мабілізацыйнай гатоўнасці войск (падраздзяленняў), арганізацыя іх баявой і паўсядзённай дзейнасці; здабыванне, збор звестак, вывучэнне і ацэнка на іх аснове становішча; падрыхтоўка аператыўна-тактычных праектаў для прыняцця камандуючым рашэнняў; планаванне аперацый (баявых дзеянняў), своечасовае давядзенне задач да войск і кантроль за іх выкананнем; арганізацыя і бесперабойнае падтрыманне ўзаемадзеяння войск; арганізацыя аператыўнага (баявога), тэхн. і тылавога забеспячэння; улік асабовага складу, яго забяспечанасці ўзбраеннем, ваен. тэхнікай і інш. матэрыяльнымі сродкамі; арганізацыя камендантскай службы, службы войск і інш.

Паводле маштабу задач падзяляюцца на стратэг., аператыўныя і тактычныя Ш.; паводле прыналежнасці — на Ш. аб'яднанняў, злучэнняў, часцей і падраздзяленняў; паводле роду дзейнасці — на агульнавайск. (агульнафлоцкія), відаў узбр. сіл, родаў войск (сіл), спец. войск і тылу. Ш. ваен. акруг (франтоў), агульнавайск. і танк. армій, армейскіх карпусоў з'яўляюцца агульнавайсковымі. Ім належыць вядучая роля ў планаванні і арганізацыі агульнавайск. аперацый (баявых дзеянняў). Ш., якія працуюць пад кіраўніцтвам камандуючых аб'яднанняў, з'яўляюцца вышэйстаячымі ў адносінах да Ш. падпарадкаваных аб'яднанняў (злучэнняў) і старшымі ў адносінах да Ш. адпаведных родаў войск, спец. войск і тылу, а таксама да Ш. аб'яднанняў і злучэнняў, што ўзаемадзейнічаюць з імі. Ш. ажыццяўляюць дзейнасць на аснове рашэнняў ці загадаў камандуючага (камандзіра, нач.), якому яны падпарадкоўваюцца, а таксама распараджэнняў вышэйстаячага Ш. Непасрэдна работай Ш. кіруе яго нач., які ва Узбр. Сілах Рэспублікі Беларусь і шэрагу інш. дзяржаў (у т.л. Рас. Федэрацыі) з'яўляецца 1-м нам. камандуючага (камандзіра). Гл. таксама *Генеральны штаб* (Дадатак).

Літ.: Гурулев С. Актуальные вопросы реформирования Вооруженных Сил Республики Беларусь // Армия. 2002. № 2; Иванов Ю. Его величество штаб // Там жа.

ШТАБ-АФІЦЭ́РЫ, назва групы старшых афіцэраў у арміях шэрагу краін. У рас. арміі катэгорыя Ш.-а. ўведзена ў пач. 18 ст. і паводле *Табеля аб рангах* 1722 да іх належалі афіцэры ад маёра да палкоўніка (на флоце — ад капітан-лейтэнанта да капітана 1-га рангу). Як правіла, з Ш.-а. складаўся *штаб* (адсюль назва). У адрозненне ад обер-афіцэраў (групы малодшых афіцэраў) Ш.-а. насілі эпалеты з махрамі і пагоны з дзвюма падоўжнымі палосамі (прасветамі). Паводле Табеля аб рангах 1884 у 8-ы клас (групу Ш.-а.) пераведзены *капітан, ротмістр*, есаул; пры гэтым яны лічыліся обер-афіцэрамі, але атрымалі права на тытулаванне Ш.-а.

ШТАБЕЛЯВА́ЛЬНАЯ МАШЫ́НА, машына, якая выбірае торф з навалаў, буртуе яго, раўняе з бакоў і павялічвае штабялі ўверх. На торфапрадпрыемствах Беларусі выкарыстоўваюць Ш.м. МТФ-71А. Машына самаходная, гусенічная, рабочы орган — каленчаты скрабалкавы самацяг, размешчаны збоку. Для ўтварэння штабялёў вышынёй 6—6,5 м самацяг мае 2 шарнірна злучаныя часткі — гарыз. (даўж. 2,4 м) і нахіленую (даўж. 10,2 м). Пры ўтварэнні штабялёў выш. 8 м абедзве часткі самацяга ўстанаўліваюцца ў адну лінію. Прывод самацяга гідраўлічны, вугал нахілу 8—42°, прывод гусенічнага ходу механічны. Кіраванне машынай гідрамеханічнае.

М.У.Кіслоў.



Штабелявальная машына МТФ-71А: 1 — нахіленая частка самацяга; 2 — скрабалкі самацяга; 3 — рама вертыкальная; 4 — рама з гусенічным ходам; 5 — контргруз; 6 — кранштэйн паваротны; 7 — гарызантальная частка самацяга; 8 — накіравальнікі.

ШТАБС-КАПІТА́Н, чын (званне) обер-афіцэраў у арміях шэрагу краін. У рас. арміі ўведзены ў 1801 (акрамя кавалерыі, існаваў да 1917). Першапачаткова прысвойваўся пам. камандзіраў рот па страявой часці, пасады якіх у 1705—98 займалі афіцэры ў званні капітан-паручніка. У кавалерыі Ш.-к. адпавядаў чыну *штабс-ротмістра.*

ШТАБС-РО́ТМІСТР, чын (званне) обер-афіцэраў у арміях шэрагу краін (пераважна ў кавалерыі). У рас. арміі ўведзены ў 1801 (існаваў да 1917). Першапачаткова прысвойваўся пам. камандзіраў *эскадронаў* па страявой часці ў драгунскіх, а пазней у інш. кав. палках. У казацкіх войсках Ш.-р. адпавядаў чыну пад'есаула, у пяхоце — *штабс-капітану.*

ШТАБЫ́ ПАРТЫЗА́НСКАГА РУ́ХУ (ШПР), спецыяльныя органы кіравання партыз. рухам на акупіраванай тэр. СССР у Вял. Айч. вайну. Былі створаны рэсп., краявыя і абл. ШПР, пры Стаўцы Вярх. галоўнакамандуючага — *Цэнтральны штаб партызанскага руху* (ЦШПР, з 30.5.1942), які ўзначаліў 1-ы сакратар ЦК КП(б)Б П.К.*Панамарэнка.* ШПР пры ваен. саветах шэрагу франтоў 28.9.1942 перафарміраваны ў прадстаўніцтва ЦШПР на тых жа франтах (акрамя Ленінградскага фронту і Укр. ШПР). Існаваў таксама Польскі штаб партыз. руху, нач. штаба якога ў 1944—45 быў В.С.*Прытыцкі.* Сваю дзейнасць штабы згортвалі па меры вызвалення акупіраванай тэр. ад праціўніка і выхаду партыз. фарміраванняў у сав. тыл. Укр. ШПР дзейнічаў да канца 1944 (расфарміраваны 1.1.1945). Гл. таксама *Беларускі штаб партызанскага руху.*

ШТАГАРЭ́НКА Андрэй Якаўлевіч (15.10.1902, г. Днепрапятроўск, Украіна — 15.9.1992), украінскі кампазітар, педагог. Нар. арт. СССР (1972). Герой Сац. Працы (1982). Скончыў Харкаўскую кансерваторыю (1936, кл. С.Багатырова). З 1954 рэктар, у 1968—89 заг. кафедры Кіеўскай кансерваторыі (з 1960 праф.). У творчасці пераважаюць

А.Я.Штагарэнка.

вак.-сімф. і сімф. жанры: 6 сімфоній (1943—83), у т.л. сімфонія-кантата «Украіна мая» (1943), 5 сюіт, у т.л. «Памяці Лесі Украінкі» (1951), канцэрты для інструментаў з аркестрам, у т.л. канцэрт-сюіта для фп. «Партызанскія карціны» (1959), камерна-інстр. ансамблі, творы для фп., музыка для драм. т-ра, кіно і інш. З 1948 сакратар праўлення Саюза кампазітараў СССР, адначасова ў 1968—89 старшыня праўлення Саюза кампазітараў Украіны. Дзярж. прэміі СССР 1946, 1952. Дзярж. прэмія Украіны 1974.

Літ.: Творчість А.Штогаренка. Київ, 1979.

ШТА́ДЭН (Staden) Генрых фон (каля 1542, г. Ален, Германія — ?), нямецкі авантурыст. Хаваючыся ад крымін. праследавання на радзіме, уцёк у Лівонію, потым у Расію, дзе стаў апрычнікам (гл. *Апрычніна*), атрымаў маёнткі, вёў гандаль віном і футрам. Пасля вяртання ў Зах. Еўропу распрацоўваў планы інтэрвенцыі ў Расію для герм. імператара Рудольфа II (1578) і швед. караля Юхана III (1581). Аўтар «Нататак пра Маскоўскую дзяржаву», якія, нягледзячы на шэраг недакладнасцей і перабольшанняў, з'яўляюцца каштоўнай крыніцай па эканам., паліт. гісторыі і геаграфіі Расіі 16 ст.

Тв.: Рус. пер. — О Москве Ивана Грозного: Зап. немца-опричника. [М.; Л.], 1925.

ШТАЙН (Stein) Генрых Фрыдрых Карл (26.10.1757, г. Насаў, — 29.6.1831), нямецкі дзярж. дзеяч. Барон. З 1780 на дзярж. службе. З 1804 міністр дэпартамента акцызаў, пошлін, фабрык і гандлю, з 1807 1-ы міністр прускага ўрада. Пасля паражэння прускай арміі ў Іена-Аўэрштэцкай бітве 1806 распачаў рэформы з мэтай мадэрнізацыі і ўзмацнення прускай дзяржавы (гл. *Штайна — Гардэнберга рэформы*). Вёў перагаворы з Францыяй па пытаннях павелічэння прускай арміі і змяншэння ваен. кантрыбуцыі (скончыліся падпісаннем Парыжскай канвенцыі 8.9.1808). Пад націскам Напалеона I звольнены ў адстаўку. З мая 1812 у Расіі, дарадчык імператара Аляксандра I. Узначальваў Ням. к-т, які адыграў значную ролю ў вызваленні Германіі ад франц. панавання. У 1813—14 на чале цэнтр. камісіі па кіраванні вызваленымі тэр. Германіі. Прыхільнік ідэі стварэння нац. ням. дзяржавы (з вер. 1812 планаваў заключэнне уніі паміж Прусіяй і Аўстрыяй і аб'яднанне пад іх кіраваннем інш. ням. дзяржаў). З 1827 чл. прускага Дзярж. савета. Заснавальнік ням. гіст. т-ва (1819).

Н.К.Мазоўка.

ШТАЙН (Stein) Петэр (н. 1.10.1937, Берлін), нямецкі рэжысёр. З 1967 працаваў у т-ры г. Брэмен. У 1970 заснаваў т-р «Шаўбюнэ» ў Зах. Берліне, узначальваў яго (да 1985). З 1991 кіраўнік Зальцбургскага муз.-тэатр. фестывалю. Паслядоўнік метадаў К.*Станіслаўскага*; яго спектаклі адметныя сыгранасцю акцёрскага ансамбля, глыбокай псіхал. распрацоўкай вобразаў, дакладным прачытаннем літ. твораў. Сярод пастановак: «Прынц Гомбургскі» Г. фон Кляйста, «Аптымістычная трагедыя» У.Вішнеўскага (абодва 1972), «Дачнікі» М.Горкага (1974), «Арэстэя» Эсхіла (1980; 1995, Масква), «Парк» Б.Штрауса, «Тры сястры» А.Чэхава (абодва 1984), «Гамлет» У.Шэкспіра (1999, Масква) і інш.

ШТА́ЙНА—ГА́РДЭНБЕРГА РЭФО́РМЫ, буржуазныя пераўтварэнні ў 1807—14 у Прусіі, здзейсненыя ўрадамі Г.Ф.К.*Штайна* і К.А.*Гардэнберга*. У 1807—11 скасавана асабістая залежнасць сялян ад землеўладальнікаў пры захаванні феад. павіннасцей за карыстанне зямлёй; дазволены продаж зямлі ўласнікамі, што дало магчымасць купляць яе замежным сялянам і гараджанам; уведзены выкуп сялянамі іх павіннасцей пры ўмове ўступкі землеўладальніку ад трэці да паловы замацаванага за селянінам зямельнага ўчастка або выплаты 25-кратнага памеру гадавых плацяжоў за яго. Гэтыя рэформы спрыялі развіццю рыначных адносін (капіталізму) у сельскай гаспадарцы пры захаванні буйнога дваранскага (юнкерскага) землеўладання і інш. феад. перажыткаў. У 1808 уведзена абмежаванае самакіраванне ў гарадах, створаны мін-вы ваен., унутр., замежных спраў, юстыцыі і фінансаў; у кожнай правінцыі ўведзена пасада обер-прэзідэнта — вышэйшага кіраўніка, што ўзмацніла бюракратычную цэнтралізацыю краіны. У 1810—11 уведзена свабода вытв. дзейнасці, якую раней стрымлівала цэхавая сістэма. Паводле ваен. рэформы 1807—14 скасаваны прывілеі дваранства на заняцце афіцэрскіх пасад, рэзка абмежаваны цялесныя пакаранні салдат, уведзена ўсеагульная воінская павіннасць (1814), створана нац. міліцыя —*ландвер*.

ШТА́ЙНТАЛЬ (Steinthal) Гейман (16.5.1823, Гробцыг, Германія — 14.3.1899), нямецкі мовазнавец; адзін з заснавальнікаў псіхал. кірунку ў мовазнаўстве і тэорыі «псіхалогіі народаў». З 1863 праф. Берлінскага ун-та. Паслядоўнік ням. мовазнаўца В.Гумбальта. Адзначаў асаблівую ролю мовы ў этнапсіхалогіі, стварыў асновы т.зв. культ. антрапалогіі. Распрацаваў анаматапаэтычную (гукаперайміальную) тэорыю паходжання мовы. Асн. працы: «Пра паходжанне мовы...» (1851), «Характарыстыка найгалоўнейшых тыпаў пабудовы мовы» (1860), «Гісторыя мовазнаўства ў грэкаў і рымлян» (т. 1—2, 1862—63). Яго погляды паўплывалі на раннія працы А.*Патабні* і младаграматыкаў.

ШТАКЕНШНЕ́ЙДЭР Андрэй Іванавіч (6.3.1802, каля г. Гатчына Ленінградскай вобл. — 20.8.1865), рускі архітэктар. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1815—20), з 1834 акад. у ёй, з 1844 прафесар. Будаваў палацы і прыватныя дамы, у якіх эклектычна выкарыстоўваў арх. стылі розных эпох. Асн. творы: у Пецярбургу — палацы Марыінскі (1839—44), Беласельскіх-Белазерскіх (1846—48), Мікалаеўскі (1853—61); «Бельведэр» у Петрадворцы (1853—56).

Літ.: Петрова Т.А. Андрей Штакеншнейдер. Л., 1973.

ШТА́ЛБЕРГ, Штальбергс (Štālbergs) Эрнестс (3.9.1883, г. Ліепая, Латвія — 12.6.1958), латышскі архітэктар. Акад. АН Латвіі (1946). Засл. дз. нав. Латвіі (1945). Скончыў Пецярбургскую АМ (1914, вучань Л.М.*Бенуа*). Выкладаў у Латв. ун-це ў Рызе (1922—50, з 1945 праф.). Работы пераважна ў духу рацыяналізму і т.зв. мадэрнізаванай класікі: рас. павільён на міжнар. выстаўцы ў Рыме (1910—11, з У.Шчуко), у Рызе — секцыйны дом на вул. Самарына (1927), актавая зала ун-та (1929—36), помнікі Свабоды (1931—35, скульпт. К.Зале), У.Леніну (1947—50, скульпт. В.Багалюбаў і У.Інгал). У 1945—51 старшыня праўлення Саюза архітэктараў Латвіі.

ШТАМ (ад ням. Stamm літар. — ствол, аснова; сям'я, племя), чыстая культура мікраарганізма, выдзеленага з пэўнай крыніцы ці атрыманага ў выніку *мутацый*. Розныя Ш. аднаго мікраарганізма часам адрозніваюцца па ўласцівасцях (напр., па *вірулентнасці*, адчувальнасці да антыбіётыкаў). Культуры Ш., што выкарыстоўваюцца ў прам-сці для мікрабіял. сінтэзу бялкоў (у т.л. ферментаў), антыбіётыкаў, вітамінаў, арган. к-т і інш. рэчываў, у выніку селекцыі маюць большую прадукцыйнасць, чым дзікія.

ШТАМБ (ад ням. Stamm ствол), частка ствала дрэва ад каранёвай шыйкі да першай шкілетнай галіны ніжняга яруса кроны. Паводле вышыні і прызначэння адрозніваюць дрэвы высока-, паў-, нізкаштамбавыя, кустападобныя і сцелістыя. Вышыню Ш. фарміруюць у залежнасці ад біял. асаблівасцей пароды дрэва (у вішні робяць больш нізкі Ш., чым у яблыні і грушы) і кліматычных умоў

(на Пн вырошчваюць дрэвы з нізкім Ш., сцелістыя формы).

ШТАМП (ням. Stampfe ад італьян. stampa пячатка), 1) штэмпель, пячатка, найчасцей прамавугольная, з выпуклым адваротным надпісам (малюнкам) назвы і адраса ўстановы, арг-цыі, прадпрыемства, якую звычайна ставяць у верхняй частцы дзелавых дакументаў; таксама сам адбітак, зроблены такой пячаткай. 2) Прылада або форма для серыйнага вырабу розных прадметаў спосабам ціску або чаканкі (гл. *Штампоўка*). 3) У пераносным сэнсе — *трафарэт, шаблон*, гатовы ўзор, які слепа пераймаюць. Адрозніваюць Ш.: ідэалаг., літ., моўныя, у мастацтве. Яны служаць для адлюстравання ў пэўных формах той ці інш. маст. задумы, настрою, ідэі (напр., моўны Ш. «чорнае золата» адпавядае паняццям «нафта», «вугаль»).

ШТАМПО́ЎКА, спосаб апрацоўкі метал. і неметал. матэрыялаў (загатовак) ціскам, пры якім форма вырабаў вызначаецца формаю *штампа*. Выкарыстоўваецца ў масавай і буйнасерыйнай вытв-сці ў аўта-, авія-, трактарабудаванні, у горным і с.-г. машынабудаванні і інш.

Паводле характару тэхнал. працэсаў, тыпу загатовак і штампаў адрозніваюць *ліставую штампоўку* і аб'ёмную (загатоўка дэфармуецца са змяненнем усіх памераў), паводле тэмпературных умоў дэфармавання — халодную і гарачую. Асаблівыя спосабы Ш. — з дапамогай энергіі выбуху, магутнага магн. поля, з выкарыстаннем эластычных (напр., гумавых) пракладак і інш. Пры Ш. адбываецца формаўтварэнне без знятця стружкі, забяспечваецца высокая дакладнасць вырабаў пры высокай прадукцыйнасці працы. Для Ш. выкарыстоўваюць *молаты* і *прэсы* (у т.л. *гідраўлічныя прэсы*), *кавальска-штамповачныя аўтаматы*. Гл. таксама *Кавальска-прэсавая вытворчасць*.

А.П.Ласкаўнёў.

ШТАНГЕНІНСТРУМЕ́НТ (ад ням. Stange стрыжань + *інструмент*), універсальны штрыхавы інструмент для вымярэння і разметкі знешніх і ўнутр. лінейных памераў. Складаецца са штангі (з губкамі) з нанесенай на яе асн. шкалой і *ноніуса* для адліку доляў асн. дзялення.

Да Ш. належаць: штангенцыркулі — для вымярэнняў дыяметраў, пазоў, глыбіні канавак і інш. (верхнія межы вымярэнняў ад 125 да 2000 мм); штангенглыбінямеры — для вымярэнняў глыбінь пазоў і адтулін (да 500 мм; гл. *Глыбінямер*); штангензубамеры — для вымярэнняў таўшчыні зубцоў зубчастых колаў (для модуляў ад 1 да 36, адлік па ноніусе 0,02 мм); штангенрэйсмусы — для вызначэння і нанясення дакладных памераў пры *разметцы* (верхняя мяжа вымярэнняў да 2500 мм; гл. *Рэйсмус*). Ш. кожнага тыпу выпускаецца некалькіх тыпапамераў з велічынямі адліку па ноніусе 0,05 і 0,1 мм. Драўляныя Ш. без ноніуса пачалі выкарыстоўваць ў 17 ст., першыя штангенцыркулі з ноніусам — у канцы 18 ст. ў Лондане.

ШТАНДА́Р (польск. sztandar ад ням. Standarte), 1) сцяг у кавалерыйскіх часцях шэрагу армій свету ў 16—20 ст., у т.л. ў арміі Рас. імперыі (з 1731). У сав. узбр. сілах Ш. наз. сцягі зводных палкоў, франтоў, ВМФ і наркамата абароны, якія ўдзельнічалі ў Парадзе Перамогі ў 1945. Ад звычайнага сцяга адрозніваецца формай (квадратная, трохвугольная), меншымі памерамі палотнішча, спосабам мацавання (упоперак дрэўка). У кав. роце (эскадроне) Ш. нёс спецыяльна прызначаны афіцэр (гл. *Карнет*). 2) Флаг кіраўніка дзяржавы (імператара, караля, прэзідэнта) і некат. вышэйшых службовых асоб, які ўзнімаецца на месцы яго прысутнасці (на ваен. караблі — суднавы Ш.).

ШТАНДА́РА, паля, стаяк у архітэктуры, драўляная калода (найчасцей дубовая ці смалістая), якую ўкопваюць у зямлю пад вугал будынка. Ш. ахоўваюць ад вільгаці зруб, а пры буд-ве на няроўным месцы ствараюць адзіны ўзровень для ўкладкі падваліны.



Штангенінструмент: а — штангенцыркуль з мяжой вымярэння да 125 (150) мм і памерам адліку 0,1 мм; б — з мяжой вымярэння да 250 (160) мм і памерам адліку 0,1 або 0,05 мм; 1 і 2 — ніжнія і верхнія губкі; 3 — стопарныя вінты; 4 — рамка; 5 — штанга; 6 — лінейка глыбінямера; 7 — ноніус; 8 — мікраметрычная падача.



Штандара. Малюнак.

Часта іх ставяць і ўздоўж сцен (нясцчыльна), што забяспечвае вентыляцыю будынка.

ШТА́ПЕЛЬ, 1) пучок паралельна размешчаных сінт. нітак даўж. 40—70 мм, з якіх вырабляюць хім. валокны (штапельнае валакно). 2) Устарэлая назва тканіны з віскознай пражы.

ШТАРК (Stark) Іаганес (15.4.1874, г. Шыкенгоф, Германія — 21.6.1957), нямецкі фізік. Чл. Берлінскай АН. Скончыў Мюнхенскі ун-т (1898). Працаваў у розных ВНУ Германіі. З 1920 праф. Вюрцбургскага ун-та, у 1933—39 прэзідэнт Фізіка-тэхн. ін-та ў Берліне. Навук. працы па оптыцы, атамнай фізіцы і тэорыі валентнасці. Выявіў адхіленне святла ў неаднароднym эл. полі, эфект Доплера ў каналавых прамянях (1905). Растлумачыў прыроду рэнтгенаўскага выпрамянення (1907). Адкрыў з'яву расшчаплення спектральных ліній у эл. полі (гл. *Штарка з'ява*). Нобелеўская прэмія 1919. Выступаў супраць тэорыі адноснасці. Падтрымліваў нацыстаў.

ШТА́РКА З'Я́ВА, расшчапленне і зрух *узроўняў энергіі* атамаў, малекул і інш. квантавых сістэм пад дзеяннем эл. поля. Выяўляецца ў змене становішча і расшчапленні *спектральных ліній* гэтых сістэм. Адкрыта І.*Штаркам* у 1913; падобная да *Зеемана з'явы*, выкліканай дзеяннем магн. поля.

У моцным эл. полі з напружанасцю E у квантавай сістэмы назіраецца разыходжанне выраджаных узроўняў энергіі, выкліканае паяўленнем дадатковай энергіі $\Delta W \sim h\Delta\nu$, дзе h — *Планка пастаянная*, $\Delta\nu$ — рознасць частот спектральных ліній. Для вадародападобных атамаў $\Delta\nu \sim E$ (лінейная Ш.з.), для астатніх атамаў $\Delta\nu \sim E^2$ (квадратычная Ш.з.). Выкарыстоўваецца Ш.з. ў спектраскапіі і радыёспектраскапіі для дыягностыкі плазмы і вывучэння будовы атамаў і малекул.

Літ.: Ельяшевич М.А. Атомная и молекулярная спектроскопия. М., 1962.

ШТАТ (ад англ. state дзяржава), 1) самакіравальная адм.-тэр. адзінка ў шэрагу федэратыўных дзяржаў (ЗША, Мексіка, Бразілія, Індыя, Нігерыя і інш.). Прававое становішча Ш., аб'ём кампетэнцыі яго органаў улады, узаемаадносіны з цэнтр. урадам вызначаюцца федэральнай канстытуцыяй. У некат. краінах (ЗША, Мексіка) Ш. маюць уласныя канстытуцыі. Узначальвае Ш. выбраны або прызначаны губернатар, паўнамоцтвы якога ў пэўнай ступені аналагічныя кампетэнцыі кіраўніка дзяржавы. Ш. маюць уласныя заканад. органы і суд. сістэму. Ш. не з'яўляецца суверэннай дзяржавай. 2) Пастаянны склад супрацоўнікаў якога-н. суб'екта гаспадарання, установы (т.зв. штатны расклад).

ШТА́ЎБАХ (Staubbach), вадаспад у Бернскіх Альпах (тэр. Швейцарыі), на р.

Вайсе-Лючыне (бас. р. Аарэ). Выш. 298 м (адзін з найвыш. у Еўропе). Турызм.

ШТА́ЎБЕРТ Аляксандр Ягоравіч (1781—1843), расійскі архітэктар. Скончыў Пецярбургскую АМ (1801). Работы на Беларусі: план *Бабруйскай крэпасці* (1818), казармы, жылыя дамы, 2 шпіталі, сабор Аляксандра Неўскага і інш. пабудовы на яе тэрыторыі (1827); Мінская і Слуцкая брамы ў Бабруйску, казармы, гасціны двор на Кобрынскім фарштаце (1836) і інш. пабудовы *Брэсцкай крэпасці*. *В.Ф.Марозаў.*

Г.**Штаўдынгер**.

Б.Ц.**Штокалаў**.

ШТА́ЎДЫНГЕР (Staudinger) Герман (23.3.1881, г. Вормс, Германія — 8.9.1965), нямецкі хімік, адзін з заснавальнікаў хіміі высокамалекулярных злучэнняў. Д-р філасофіі (1903). Вучыўся ва ун-тах Гале і Мюнхена (1898—1900). З 1903 працаваў у Страсбургскім ун-це. З 1908 праф. Вышэйшай тэхн. школы ў Карлсруэ, Федэральнай вышэйшай школы ў Цюрыху (1912—26) і Фрайбургскага ун-та (1926—51). Дырэктар Дзярж. ін-та высокамалекулярных злучэнняў (1940—56). Асн. навук. працы па хіміі высокамалекулярных злучэнняў. Даказаў, што палімеры складаюцца з вял. малекул. Увёў тэрмін «макрамалекула», распрацаваў тэорыю будовы палімераў. Нобелеўская прэмія 1953.

ШТА́ЎТЭ (Staudte) Вольфганг Георг (9.10.1906, г. Саарбрукен, Германія — 19.1.1984), нямецкі кінарэжысёр. З 1926 акцёр т-ра «Фолксбюнэ» ў Берліне. Працаваў у трупах М.Райнгарта і Э.Піскатара. З 1931 здымаўся ў кіно, ставіў рэкламныя фільмы. Адзін са стваральнікаў кінастудыі «ДЭФА» (1946). З 1966 праф. кінашколы ў Зах. Берліне. Яго лепшыя фільмы антыфаш. накіраванасці: «Забойцы сярод нас» (1946, у сав. пракаце «Яны не схаваюцца»), «Ратацыя» (1949, у сав. пракаце «Карычневая павуціна»), «Вернападданы» (1951, паводле Г.Мана), «Ружы для пана пракурора» (1959, за абодва прэміі Міжнар. кінафестываляў у Карлавых Варах), «Кірмаш» (1960), «Мужчынская кампанія» (1964) і інш. У іх спалучэнне жорсткай рэаліст. манеры і элементаў экспрэсіянісцкай стылізацыі, якая падкрэслівае неўладкаванасць чалавечых лёсаў, спустошанасць і разгубленасць людзей, якія перажылі вайну.

ШТА́ЎФЕНЫ (Staufen), Гогенштаўфены (Hohenstaufen), дынастыя герм. каралёў і імператараў «Свяшчэннай Рым. імперыі» ў 1138—1254; швабскі княжацкі род (у 1079—1268 герцагі Швабіі). Названы паводле іх родавага замка ў Швабіі Гогенштаўфен. Прадстаўнікі Ш. — каралі і імператары: Конрад III [1138—52], пры ім пачалася працяглая барацьба Ш. з Вельфамі; *Фрыдрых I Барбароса* [1152—90]; Генрых VI [1190—97], пры ім Ш. замацаваліся ў *Сіцылійскім каралеўстве*; Філіп Швабскі [1198—1208]; *Фрыдрых II* [1212—50]; Конрад IV [1250—54]. Апошнія прадстаўнікі роду Ш. — Манфрэд (сіцылійскі кароль у 1258—66) і Конрадзін (памёр у 1268, сын Конрада IV) загінулі ў барацьбе з Карлам I Анжуйскім (1226—85).

ШТОК (ням. Stock літар. — палка, ствол) у геалогіі, інтрузіўнае цела адносна невял. памераў у сячэнні (часам да некалькіх кіламетраў), працяглае на глыбіню, з формай, блізкай да цыліндрычнай. Рудны Ш. — цела суцэльных або амаль суцэльных руд (да дзесяткаў метраў у папярочніку).

ШТО́КАЛАЎ Барыс Цімафеевіч (н. 19.3.1930, г. Кузнецк Пензенскай вобл., Расія), расійскі спявак (бас). Нар. арт. СССР (1966). Скончыў Уральскую кансерваторыю ў Свярдлоўску (1954). З 1954 саліст т-раў Свярдлоўскага, у 1959—89 Ленінградскага оперы і балета. Яго мастацтва вылучаецца стрыманай, высакароднай манерай выканання, інтанацыйнай выразнасцю. Валодае прыгожым, мяккага гучання голасам. Сярод партый: Мельнік («Русалка» А.Даргамыжскага), Дэман («Дэман» А.Рубінштэйна), Сусанін, Руслан («Іван Сусанін», «Руслан і Людміла» М.Глінкі), Дасіфей, Барыс Гадуноў («Хаваншчына», «Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага), Галіцкі («Князь Ігар» А.Барадзіна), Дон Базіліо («Севільскі цырульнік» Дж.Расіні). У рэпертуары рус. нар. песні, рамансы. Дзярж. прэмія Расіі 1976. Дзярж. прэмія СССР 1981.

Літ.: Коннов А. Б.Штоколов. 2 изд. Л., 1987.

ШТО́КВЕРК (ням. Stockwerk), рудное цела няправільнай формы, утворанае масай горнай пароды, пранізанай густой сеткай розна арыентаваных жыл, пражылкаў і ўкрапанікаў рудных мінералаў.

Вядомы Ш. лінейныя і ізаметрычныя па плошчы, памерамі ад дзесяткаў метраў да некалькіх кіламетраў. Ш. адносяць да групы гідратэрмальных утварэнняў, якія ўзнікаюць пры адкладанні металаноснага рэчыва з гарачых мінералізаваных растворaў, што цыркулююць сярод трэшчынаватых горных парод. Да іх належаць некат. радовішчы руд медзі, малібдэну, вальфраму, золата, волава і інш.

ШТО́КГАЎЗЕН (Stockhausen) Карлхайнц (н. 22.8.1928, Мёдрат, каля г. Кёльн, Германія), нямецкі кампазітар, муз. тэарэтык; адзін з вядучых прадстаўнікоў муз. *авангардызму*. Вучань А.*Месіяна* і інш. З 1963 кіраўнік студыі электроннай музыкі Зах.-герм. радыё. У 1971—77 праф. Кёльнскай вышэйшай школы. У імкненні да стварэння універсальнай «музыкі ўсяго свету» звяртаецца да розных муз. сродкаў, у т.л. электроннай музыкі, розных тэхн. прыстасаванняў. З канца 1960-х г. для яго музыкі характэрны сузіральна-медытатыўны характар. Сярод твораў: «Спевы отракаў» (для 5 магнітафонаў, 1956), «Спіраль» (для саліста і кароткахвалевага прыёмніка, 1969), «Сірыус» (для сапрана і ансамбля, 1977) і інш. Выступае як дырыжор, піяніст і гукарэжысёр у выкананні асабістых твораў. Аўтар прац па псіхалогіі муз. ўспрымання, праблемах муз. часу. У 1978 адбыўся Міжнар. конкурс кампазітараў яго імя (Італія).

ШТОКРУ́ЖА (Alcea), род кветкавых раслін сям. мальвавых. Каля 60 відаў. Пашыраны пераважна ў Міжземнамор'і. На Беларусі культывуюць 2 віды Ш.: маршчакаватая (A.rugosa) і ружовая (A.rosea).

Двух- і шматгадовыя травяністыя расліны. Сцёблы выш. да 2 м, прамыя, разгалінаваныя. Лісце чаргаванае, суцэльнае або пальчата-раздзельнае. Кветкі буйныя, рознай афарбоўкі, часта махрыстыя, адзіночныя або сабраныя ў верхавінкавыя гронкападобныя суквецці. Плод з 18—40 плодзікаў. Чорна-чырв. пялёсткі Ш. ружовай, якую часам наз. мальвай, выкарыстоўваюць для падфарбоўкі віна, лікёраў, афарбоўкі тканін; са сцёблаў атрымліваюць грубыя валокны. Меданосныя, тэхн., лек., дэкар. расліны. *Дз.І.Трацякоў.*



Штокружа (махрыстая форма).

ШТО́ЛЬНЯ (ад ням. Stollen), гарызантальная ці нахіленая *горная выработка* з выхадам на зямную паверхню. Прызначаецца для абслугоўвання *горных работ*. Мае памеры, дастатковыя для перамяшчэння людзей і грузаў. Ш. могуць быць разведачныя і эксплуатацыйныя (для распрацоўкі радовішча). У залежнасці ад прызначэння адрозніваюць трансп., вентыляцыйныя, водаадліўныя.

ШТО́МПЕЛЬ Барыс Мікалаевіч (29.10.1932, г. Кемерава, Расія — 22.7.2000), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1990), праф. (1994). Скончыў Запарожскі ін-т с.-г. машынабудавання (1955). Працаваў інжынерам-канструктарам на Мінскім трактарным з-дзе. З 1957 у Бел. НДІ механізацыі сельскай гаспадаркі. З 1967 у Бел. агр. тэхн. ун-це. Навук. працы ў галіне эканомікі механізацыі с.-г. вытв-сці, тэхн. сервісу, эканам. экалогіі. Распрацаваў методыку вызначэння эфектыўнасці інвестыцыйных укладанняў, эканам. ацэнкі экалаг. мерапрыемстваў, прагназіравання эканам. мерапрыемстваў на перспектыву.

Тв.: Эксплуатация и ремонт тракторов «Беларусь»: (Экон. вопр). Мн., 1975 (у сааўт.); Особенности рыночного механизма управления субъектами хозяйствования в эколого-дестабилизированном регионе. Гомель, 1999 (у сааўт.). *Л.В.Бароўка.*

ШТОП Яўген Аляксандравіч (н. 25.10.1939, г. Ваўкавыск Гродзенскай вобл.), бел. дзеяч самадзейнага мастацтва. Засл. работнік культ. Беларусі (1975). Скончыў Вышэйшую прафс. школу ў Ленінградзе (1973). З 1958 артыст-акрабат Бел. філармоніі, у 1959—60 артыст, у 1978—79 балетмайстар Дзярж. ансамбля танца Беларусі. У 1964—77 і з 1979 маст. кіраўнік Гродзенскага нар. ансамбля танца «Раніца». У 1987—2003 маст. кіраўнік створанага ім ансамбля *«Белыя росы»*. Папулярызатар бел. і рус. танц. фальклору. Сярод пастановак танцы «Трапятуха», «Бульба», «Лявоніха», «Чарніца», лірычны карагод «Верасы» і інш. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1982.

ШТО́ПАР (галанд. stopper ад stop пробка), 1) у а в і я ц ы і — зніжэнне лятальнага апарата (ЛА) — самалёта, планёра па крутой вінтавой лініі з адвольным вярчэннем вакол верт. восі.

Бывае нармальны (уніз коламі) і перавернуты (уверх коламі), устойлівы і няўстойлівы, правы і левы, круты (вугал нахілу падоўжнай восі ЛА да гарызонту больш за 50°), пакаты (30—50°) і плоскі (менш за 30°). Зрыў у Ш. адбываецца ад памылкі лётчыка ці дэфекту ЛА. Наўмысны Ш. — адна з фігур вышэйшага *пілатажу*, часам выконваецца пры выпрабаваннях ЛА і ў вучэбных мэтах.

2) Скручаны ў спіраль стрыжань з тоўстага, звычайна стальнога дроту (дыям. да 20 мм) з швартовачным кольцам на канцы. Укручаны ў грунт, дрэва, лёд служыць для швартоўкі самалётаў, планёраў, верталётаў, невял. суднаў, мацавання палаткаў і інш. 3) Вінтавы стрыжань з кольцам або рукаяткай на канцы для выцягвання коркаў і розных заглушак.

ШТОРМ (галанд. storm), гл. ў арт. *Бура*.

ШТО́РМЕР (Störmer) Горст Людвіг (н. 6.4.1949, г. Франкфурт-на-Майне, Германія), амерыканскі фізік. Чл. Нац. АН ЗША (1999), Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1992). Скончыў Франкфурцкі (1970) і Штутгарцкі (1977) ун-ты. З 1978 у ЗША, у фірме «Бел лабораторыз». З 1998 праф. Калумбійскага ун-та. Навук. працы па фізіцы кандэнсаваных асяроддзяў, даследаванні ўласцівасцей паўправаднікоў і нізкаразмерных электронных сістэм. Адкрыў дробавы квантавы эфект Хола (з А.Госардам і Д.Ч.*Цуем*, 1982). Нобелеўская прэмія 1998 (з Р.Б.*Лафлінам* і Цуем).

Г.Л.**Штормер**.

І.**Штраус**-сын.

Тв.: Рус. пер. — Дробный квантовый эффект Холла // Успехи физ. наук. 2000. Т. 170, № 3. *М.М.Касцюковіч.*

ШТОС (ням. Stoß) Фейт [польск. Стош, Ствош (Stosz, Stwosz, Stvos) Віт; 1447 або 1448, Горб, Германія — 1533], нямецкі і польскі мастак і скульптар; прадстаўнік позняй готыкі. У час падарожжаў па Швабіі і верхнім Рэйне паз-



Штопар самалёта.

наёміўся з творчасцю І.Мульчэра, М.Шонгаўэра і Н.Герхарта з Лейдэна, які, магчыма, быў яго настаўнікам. У 1477—96 жыў і працаваў у г. Кракаў (Польшча). Па заказе гар. рады стварыў у парафіяльным касцёле Дзевы Марыі (Марыяцкім) гал. алтар (1489), які спалучае круглую драўляную скульптуру ў цэнтр. ч. з рэльефамі на створках і жывапісам (фонавыя краявіды ў рэльефах). Пазней працаваў пераважна ў камені: барэльефы «Агруец» (каля 1485), «Укрыжаванне» для Марыяцкага касцёла (каля 1491); надмагіллі свецкіх і духоўных саноўнікаў: Казіміра Ягелончыка ў кафедральным касцёле на Вавелі (каля 1492), біскупа Пятра з Бніна ў кафедральным касцёле ва Улацлаваку (1493—94), прымаса З.Аляснцкага ў кафедральным касцёле ў Гнезне (1495), бронзавае надмагілле Ф.Буанакорсі ў касцёле дамініканцаў у Кракаве (1496—1500).

Займаўся графікай (захавалася 10 работ). З 1496 у г. Нюрнберг (Германія), дзе выканаў т.зв. Мадонну з дома Ш. (каля 1499), кампазіцыю «Дабравешчанне» для касцёла св. Лаўрэнція (1518), праект т.зв. Бамбергскага алтара — трыпціх для кармеліцкага касцёла св. Сальватара (1520—23; захаваўся часткова). Яго скульпт. работы вызначаюцца дынамізмам, моцнай экспрэсіяй, глыбокім унутр. драматызмам.

Літ.: D e t t l o f f S. Wit Stosz. T. 1—2. Wrocław, 1961. *Н.К.Мазоўка.*

ШТРА́УС (Strauß) Іаган (Ш т р а у с - б а ц ь к а; 14.3.1804, Вена — 25.9.1849), аўстрыйскі скрыпач, дырыжор, кампазітар. З 1819 удзельнік квартэта, з 1824 пам. дырыжора аркестра І.Ланера. У 1825 арганізаваў уласны танц. аркестр, з якім шмат гастраліраваў. Адзін з папулярных майстроў танц. музыкі; стваральнік (з Ланерам) т.зв. венскага *вальса*. Пісаў цыклы з 5 вальсаў з інтрадукцыяй і кодай. Аўтар больш за 250 твораў, у т.л. вальсаў («Дунайскія песні», «Тальёні», «Вальс баядэрак»), кадрыляў, галопаў, маршаў і інш.

ШТРА́УС (Strauß) Іаган (Ш т р а у с - с ы н; 25.10.1825, Вена — 3.6.1899), аўстрыйскі кампазітар, скрыпач, дырыжор. Старэйшы сын І.Штрауса-бацькі. З уласным аркестрам гастраліраваў у многіх краінах свету (у ЗША праславіўся як «кароль вальса»). Абапіраючыся на традыцыі аўстр. нар.-танц. культуры і венскі муз. побыт, стварыў класічныя ўзоры венскага вальса і венскай танц. аперэты. Сярод твораў: аперэты «Лятучая мыш» (паст. 1874; у Бел. т-ры оперы і балета 1961; Магілёўскім абл. т-ры муз. камедыі 1966; Дзярж. т-ры муз. камедыі Беларусі 1981), «Ноч у Венецыі» (паст. 1883; у Дзярж. т-ры муз. камедыі 1983), «Цыганскі барон» (паст. 1885; у Бел. т-ры оперы і балета 1960; Дзярж. т-ры муз. камедыі 1997) і інш.; шматлікія вальсы, у т.л. «На цудоўным блакітным

Дунаі», «Казкі венскага лесу», «Жыццё артыста», полькі, кадрылі, маршы, галопы. На муз. Ш. пастаўлены балеты «Блакітны Дунай» у Бел. т-ры оперы і балета (1958), «Штраусіяна» ў Дзярж. т-ры муз. камедыі (1992). Аўтар каля 500 твораў танц. музыкі.

Літ.: Майлер Ф. И.Штраус: Пер. с нем. М., 1980.

ШТРА́УС (Strauß) Рыхард (11.6.1864, г. Мюнхен, Германія — 8.9.1949), нямецкі кампазітар, дырыжор. Чл. Берлінскай (1909), ганаровы чл. Венскай (1944) АМ. У 1886—1924 дырыжор у оперных

Р.Штраус.

т-рах Мюнхена, Веймара, Берліна, Вены, адначасова ў 1917—20 выкладаў у Берлінскай АМ. У 1933—35 прэзідэнт Імператарскай муз. палаты ў Берліне. Працаваў з рознымі аркестрамі Еўропы, ЗША. Прыхільнік праграмнага сімфанізму, экспрэсіўнай вобразнасці. У творчасці зазнаў уплыў кампазіцыйнай тэхнікі Р.Вагнера, развіваў эстэт. прынцыпы неарамантызму, экспрэсіянізму. Асн. творчыя здабыткі ў сімф. і оперным жанрах: оперы «Саламея» (паводле О.Уайльда, паст. 1905), «Электра» (паводле Сафокла, паст. 1909), «Кавалер ружы» (паст. 1911); сімф. паэмы «Дон Жуан» (1889), «Тыль Уленшпігель» (1895), «Жыццё героя» (1898); сімф. варыяцыі «Дон Кіхот» (1897), «Дамашняя сімфонія» (1903), «Альпійская сімфонія» (1915). Зрабіў уклад у фарміраванне неарамантычнай стылістыкі ў *гармоніі* і *аркестроўцы*.

Літ.: Краузе Э. Рихард Штраус: Пер. с нем. М., 1961; Крауклис Г. Симфонические поэмы Р.Штрауса. М., 1970; Ступель А.М. Рихард Штраус. Л., 1972.

Т.А.Дубкова.

ШТРА́УС (Strauß) Франц Іосеф (6.9.1915, г. Мюнхен, Германія — 3.10.1988), нямецкі дзярж. і паліт. дзеяч. У 1939—45 у арміі. Адзін з заснавальнікаў і ў 1961—88 лідэр заходнегерм. партыі Баварскі саюз хрысц. сацыялістаў (ХСС). У 1949—78 чл. бундэстага. З 1953 міністр без партфеля, міністр па справах атамнай энергіі, у 1956—62 міністр абароны. Прыхільнік узбраення бундэсвера ядзернай зброяй. Пад націскам грамадскай думкі пасля выяўлення т.зв. аферы «Шпігеля» (паліцэйскай акцыі супраць выдаўцоў і рэдактара штотыднёвіка «Der Spiegel», абвінавачаных у раскрыцці вайск. тайны) вызвалены ад абавязкаў. У 1966—69 міністр фінансаў. У 1978—80 прэм'ер Баварыі. Прыхільнік саюза ФРГ з ЗША, еўрап. інтэграцыі, аб'яднання Германіі. Аўтар прац, у якіх развіваў свае паліт. канцэпцыі («Праект для Еўропы», 1966; «Выклік і адказ», 1968).

Н.К.Мазоўка.

ШТРАЎХ Максім Максімавіч (23.2.1900, Масква — 3.1.1974), расійскі акцёр і рэжысёр. Нар. арт. СССР (1965). Сцэн. дзейнасць пачаў у 1921. З 1929 працаваў у Т-ры імя У.Меерхольда, у 1932—50 і з 1959 у Маскоўскім т-ры імя У.Маякоўскага, у 1950—57 у Малым т-ры СССР. Сярод найб. значных роляў: Пабеданосікаў, Прысыпкін («Лазня», «Клоп» Маякоўскага), Кіруючая асоба («Мой сябар» М.Пагодзіна), Рубінчык («Вуліца радасці» Н.Зархі) і інш. Яго творчасці ўласцівы тонкі псіхалагізм, майстэрства вострай сцэн. формы, схільнасць да эксцэнтрыкі і публіцыстычнага гратэску. Паставіў спектаклі: «Лесвіца славы» Э.Скрыба (1936), «Апошнія» М.Горкага (1937), «Матухна Кураж і яе дзеці» Б.Брэхта (1960) і інш. Здымаўся ў кіно: «Чалавек з ружжом» (1938), «Змова асуджаных» (1950), «Забойства на вуліцы Дантэ» (1956), «Апавяданні пра Леніна» (1958; прэмія Міжнар. кінафестывалю ў Карлавых Варах 1959) і інш. Дзярж. прэміі СССР 1949, 1951, Ленінская прэмія 1959.

Літ.: Туровская М., Медведев Б. М.М.Штраух. М., 1952; Шахов Г. М.М.Штраух. М., 1964.

ШТРАФ (ад ням. Strafe пакаранне), грашовае спагнанне, мера матэрыяльнага ўздзеяння, якая ўжываецца ў выпадках і парадку, устаноўленых законам або дагаворам. У цывільным праве Ш. — від *няўстойкі*, што спаганяецца з даўжніка ў выпадку невыканання або неналежнага выканання ім абавязацельства; адзін са спосабаў забеспячэння выканання абавязацельстваў. У крымінальным праве Ш. — мера пакарання ў выглядзе грашовага спагнання, якое назначаецца судом у выпадках, прадугледжаных законам. Памер Ш. вызначаецца з улікам памеру мінім. зарплаты, устаноўленай на дзень вынясення прысуду, у залежнасці ад характару і ступені грамадскай небяспекі ўчыненага злачынства і матэрыяльнага становішча асуджанага. Як адм. спагнанне Ш. накладаецца на асоб, вінаватых у адм. правапарушэннях. Заканадаўствам вызначаны падставы, парадак, памер і кола службовых асоб, якія паўнамоцны накладаць адм. Ш.

Э.І.Кузьмянкова.

ШТРО́ГЕЙМ, Штрохейм (Stroheim) Эрых фон (22.9.1885, Вена — 12.5.1957), амерыканскі кінарэжысёр, акцёр. Атрымаў ваен. адукацыю. З 1909 жыў у ЗША, з 1914 у Галівудзе. Здымаўся ў невял. ролях, быў сцэнарыстам, дэкаратарам. У акцёрскіх і рэжысёрскіх работах спалучаў сарказм, гратэск, сатыру з рэаліст. дакумент. дакладнасцю. Найб. значны фільм — «Прагнасць» (1924). Яго фільмы «Сляпыя мужы» (1918), «Вясёлая ўдава» (1925), «Вясельны марш» (1928) і інш. адметныя цікавасцю да рэзкіх жыццёвых супрацьлегласцей, арыгінальнасцю рэжысёрскага бачання, вастрынёй у абмалёўцы характараў. Зняўся ў фільмах «Вялікая ілюзія» (1937), «Гібралтар» (1938; у сав. пракаце «Сіло шпіянажу»), «Пяць грабніц на шляху ў Каір» (1943), «Сансет бульвар» (1950) і інш. Аўтар шматлікіх сцэнарыяў. Займаўся літ. дзейнасцю.

Літ.: Королевич В., Аташева П. Эрих Штрогейм. М.; Л., 1927.

ШТРЫ́ТМАТЭР (Strittmatter) Эрвін (14.8.1912, г. Шпрэмберг, Германія — 31.1.1994), нямецкі пісьменнік. Чл. Ням. АМ (1959). У псіхал. раманах «Паганяты валоў» (1950), «Цінка» (1954), «Оле Бінкап» (1963) сакавіты гумар вясковага бытапісца, блізкасць да фальклору, вобразы сял. мудрацоў. Раман «Цудадзей» (ч. 1—3, 1957—80) развівае традыцыі «рамана выхавання». У рамане «Крама» (ч. 1—3, 1983—92), зб-ках навел і апавяд. «Аўторак у верасні» (1969), «Сіні салавей, або Так гэта пачынаецца» (1972), «Мая прыяцелька Ціна Бабэ» (1977), аповесці «Зялёны чэрвень» (1985) і інш. праблемы мастацтва і жыцця, духоўнага станаўлення асобы, асэнсавання трагічнага мінулага Германіі. Аўтар аповесці для дзяцей «Поні Педра» (1958), зб. лірычных мініяцюр і прытчаў «Шульцэнгофскі каляндар усякай усячыны» (1966), аўтабіягр. кн. «Перад ператварэннем» (выд. 1995), драм, афарызмаў, літ.-крытычных артыкулаў. На бел. мову яго асобныя апавяданні пераклалі Я.Семяжон, В.Сёмуха. Нац. прэміі ГДР 1953, 1955, 1964, 1976.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Незабыўны дзень. Мн., 1973; Рус. пер. — Избранное. М., 1984; Романы в стенограмме. М., 1978; Лавка. М., 1986.

Літ.: Риндфляйш Р. Эрвин Штриттматтер // Писатели ГДР: Пер. с нем. М., 1984.

Е.А.Лявонава.

ШТРЫХАВА́НАЙ КЕРА́МІКІ КУЛЬТУ́РА, археалагічная культура балцкіх плямён, якія ў 7—6 ст. да н.э. — 4—5 ст. н.э. насялялі тэр. сярэдняй Беларусі і ўсх. Літвы. Назва ад глінянага посуду, знешняя (часта і ўнутраная) паверхня якога пакрывалася штрыхамі. Паводле асаблівасцей развіцця вылучаюць 3 яе храналагічныя перыяды. На 1-м этапе (7—5 ст. да н.э.) насельніцтва жыло на адкрытых паселішчах, якія размяшчаліся на ўзвышэннях у паплавах рэк і азёр і мысападобных выступах 1-й надпоплаўнай тэрасы. У ахаваных прыродных мясцінах (на ўзгорках, часам сярод балот або на мысах па берагах рэк і азёр) ствараліся *гарадзішчы*. Самыя ранніе з іх умацоўваліся па краі пляцовак толькі драўлянай сцяной, а схілы ўзгорка або мыса штучна зраза́ліся, чым дасягалася большая стромкасць. Былі пашыраны прылады працы з косці, рогу, крэменю, дрэва (каменныя сякеры, зерняцёркі, тачыльныя брускі і інш.), касцяныя і

рагавыя ўпрыгожанні. Выраблялiся разнастайныя пасудзіны: слоікападобныя, з конусападобным і выпуклым тулавам, гладкасценныя або штрыхаваныя гаршкі (з прамым або адагнутым венчыкам, кароткай шыйкай, апушчаным або прыўзнятым плечуком і выпуклым тулавам, плоскім ці круглаватым дном). Па шыйцы іх арнаментавалі рознымі па дыяметры ямкавымі ўцісканнямі, якія размяшчаліся па адным у рад або групамі па 2—3 у кожнай, часам у выглядзе трохвугольнікаў. У гаспадарцы побач з лядным земляробствам і жывёлагадоўляй значную ролю адыгрывалі паляванне і рыбалоўства. На 2-м этапе (4—1 ст. да н.э.) у плямён Ш.к.к. ўзніклі новыя, добра ўмацаваныя гарадзішчы, а ранейшыя перабудоўваліся: пляцоўкі павялічвалі, па іх краях з боку поля насыпалі валы і выкопвалі равы. Насельніцтва жыло ў вял. доўгіх дамах слупавой канструкцыі, падзеленых на некалькі (ад 3 да 6) жылых памяшканняў. Унутры іх размяшчаліся агнішчы круглай, авальнай ці падковападобнай формы, абкладзеныя па краях камянямі або валікамі гліны. Разам з каменнымі, касцянымі, рагавымі вырабамі выкарыстоўваліся і жал. прылады працы, зброя. Ва ўжытку па-ранейшаму былі таўстасценныя і слабаабпаленыя слоікападобныя пасудзіны і гладкасценныя або штрыхаваныя гаршкі. На 3-м этапе (1—5 ст.н. э.) гарадзішчы ўмацоўвалі складанай сістэмай земляных валоў з драўлянымі канструкцыямі на іх грэбені і глыбокіх равоў. На змену доўгім дамам прыйшлі невял. чатырохвугольныя наземныя жытлы слупавой канструкцыі з адкрытымі агнішчамі ўнутры. Асн. галінамі гаспадаркі былі ляднае земляробства і жывёлагадоўля, а таксама апрацоўка жалеза, косці, рогу, каменю, дрэва, бронзалiцейная справа, ганчарства, прадзенне, ткацтва, пляценне і інш. Насельніцтва вырабляла і ўжывала жал. сякеры, нажы, нажы для жніва, брытвы з выпуклым лязом, сярпы, падковападобныя і латэнскага тыпу фібулы, посахападобныя шпількі, бронзавыя пярсцёнкі, драцяныя скроневыя кольцы, спіралькі, падвескі і інш. ўпрыгожанні, жал. іголкі і шылы, наканечнікі коп'яў і дроцікаў, гліняныя прасліцы (часта арнаментаваныя наразнымі лініямі і кропкавымі ўзорамі ў выглядзе трохвугольнікаў, ромбаў і трапецый) і інш. Кераміка — штрыхаваныя і гладкасценныя рабрыстыя і слабапрафіляваныя гаршкі і пасудзіны слоікавай формы, арнаментаваныя па рабры і ў верхняй частцы зашчыпамі, ямкавымі і пазногцевымі ўцісканнямі, насечкамі і інш. Трапляюцца глянцаваны і падглянцаваны посуд, мініяцюрныя пасудзіны міскападобных і слоікападобных форм. Да прывазных вырабаў адносяцца падковападобныя фібулы з выемчатай эмаллю, бляхі з выявай галоўкі арла і выпуклыя бляшкі з пяцелькамі з тыльнага боку. Найб. даследаваныя помнікі Ш.к.к. ў Беларусі — *Аздзяцічы, Банцараўшчына, Вязынка, Гарадзішча, Дзедзілавічы, Івань, Кімія, Лабеншчына*,, Малышкі, Мыслі (Вілейскі і Капыльскі р-ны Мінскай вобл.), *Рацюнкі*.

Літ.: Археалогія Беларусі. Т. 2. Мн., 1999.

А.Р.Мітрафанаў.

Да арт. **Штрыхаваная керамікі культура**. Упрыгожанні з гарадзішча Івань.

ШТРЫХАВЫ́ КОД (ад ням. Strich паласа, рыса + *код*), міжнародны код тавараў, код (візуальны сімвал, умоўны відарыс) літарна-лічбавай інфармацыі, выкананы ў выглядзе чаргавання кантрастных штрыхоў і прамежкаў (прагалаў) рознай шырыні. Выкарыстоўваецца для маркіроўкі тавараў, аўтаматызацыі паштовых паслуг (адпраўленняў), уліку дакументаў і наяўных грашовых банкнот у банках, для аўтам. ідэнтыфікацыі розных аб'ектаў, спрацоўвання (уключэння, адключэння, блакіроўкі) замковых прыстасаванняў тэхнал. абсталявання і інш.

Ш.к. (лінейны) распрацаваны ў 1932, выкарыстанне пачалося з пашырэннем выліч. тэхнікі. Прамысл. стандарты штрыхавога кадзіравання прыняты ў 1973 у ЗША і Канадзе (стандарт UPC), у 1976 у Еўропе (стандарт EAN). У краінах Еўропы і Амерыкі з'явіліся нац. асацыяцыі (арганізацыі) кадзіравання тавараў. Найб. пашыраныя стандарты штрыхавой сімволікі: EAN, UPC выкарыстоўваюцца для ідэнтыфікацыі спажывецкіх тавараў, у рознічным і аптовым гандлі; Code 39, Interleved 2 of 5 — пераважна ў прам-сці; Codabar — у асн. у мед. прам-сці, банках пералівання крыві; ISSN, ISBN — у выдавецкакнігагандлёвай і бібліятэчнай справе. З уступленнем у Еўрап. асацыяцыю EAN неэўрапейскіх дзяржаў сістэма атрымала міжнар. статус. У ёй 13 лічбаў: першыя 2 ці 3 паказваюць краіну-вытворцу (код Беларусі 481, Расіі 460—469, Польшчы 590, Германіі 400—440, ЗША і Канады 00—09, Турцыі 869, Кітая 690—691), наступныя 5 — прадпрыемствы, наступныя 5 — тавары і апошняя лічба — кантрольная. Карыстанне Ш.к. забяспечваюць прыстасаванні: друкавальнае (прынтэр, наносіць код на этыкеткі), счытвальнае (сканер, счытвае і дэкадзіруе штрых-кодавую інфармацыю), тэрмінальнае (збірае і апрацоўвае інфармацыю). Сусветны лідэр у распрацоўцы і выпуску абсталявання для штрыхавога кадзіравання — шведскі канцэрн UBI.

Б.В.Корзун.

Штрыхавы код EAN-13 ідэнтыфікацыі тавараў.



Г.Штрэземан.

ШТРО́ЗЕМАН (Stresemann) Густаў (10.5.1878, Берлін — 3.10.1929), нямецкі дзярж. і паліт. дзеяч, дыпламат. Д-р філасофіі і права (1902). Вучыўся ў Берлінскім і Лейпцыгскім ун-тах. У 1903—18 нам. старшыні Саюза герм. прамысловасці. З 1907 неаднаразова выбіраўся дэпутатам рэйхстага. У 1-ю сусв. вайну прыхільнік анексій. З 1918 і да канца жыцця лідэр нямецкай нар. партыі. У жн.—ліст. 1923 рэйхсканцлер, узначаліў урад т.зв. вял. кааліцыі. Як прыхільнік моцнай улады, перапыняў нападкі на існуючы лад з боку і левых і правых экстрэмісцкіх сіл (падавіў камуніст. паўстанні ў Саксоніі і Цюрынгіі, «піўны путч» 1923 у Мюнхене). У 1923—29 міністр замежных спраў. Устанавіў цесныя кантакты з большасцю зах. краін, паслядоўна выконваючы ўсе ўмовы Версальскага дагавора 1919. У 1924 прыняў план Даўэса па рэпарацыях, падпісаў Лакарнскія дагаворы 1925, у 1926 прывёў Германію ў Лігу Нацый і падтрымаў план О. Юнга па рэпарацыях, падпісаў пакт Брыяна—Келага 1928, які абвясціў адмову ад вайны як зброі нац. палітыкі. Выступаў за развіццё адносін з СССР (Берлінскі дагавор аб нейтралітэце 1926). Нобелеўская прэмія міру 1926 (з А.Брыянам). *Н.К.Мазоўка.*

ШТРЭЙКБРЭ́ХЕР (ням. Streikbrecher літар. — стачкалом), асоба, якая адмаўляецца ад удзелу ў забастоўцы і займае бок адміністрацыі.

ШТРЭК (ням. Strecke літар. — адлегласць, працягласць), гарызантальная падземная *горная выработка*, якая праведзена ў напрамку распасціравання ка-

рыснага выкапня ці пароды і не мае непасрэднага выхаду на паверхню. Бываюць галоўныя і прамежкавыя; панэльныя, паверхавыя, ярусныя, выемачныя; транспартныя, вентыляцыйныя, пажарныя і інш.

ШТУ́КІН Сяргей Сяргеевіч (н. 22.5.1945, в. Казьяны Шумілінскага р-на Віцебскай вобл.), бел. вучоны ў галіне лесаводства. Д-р с.-г. н. (2000). Скончыў Бел. тэхнал. ун-т (1973). З 1973 на Дзвінскай эксперым. базе Ін-та лесу Нац. АН Беларусі. З 2001 у Бел. дзярж. тэхнал. ун-це. Навук. працы па плантацыйным вырошчванні лесу хвойных парод, узнаўленні лясных рэсурсаў і сістэм ацэнкі якасці лясных культур.

Тв.: Плантационное выращивание сосны и ели на дренированных почвах. Мн., 1997; Изменение устойчивости хвойных биоценозов в связи с антропогенным воздействием // Природные ресурсы. 2001. № 1.; Лесовосстановление и лесовыращивание на дренированных почвах // Лесное хозяйство. 2001. № 4.

ШТУНДЫ́ЗМ (ад ням. Stunde гадзіна, час малітвы), пратэстанцкая плынь у 2-й пал. 19 ст. ў Расіі і на Украіне. Узнік на Пд Расіі пад уплывам ням. каланістаў, у канцы 19 ст. прыхільнікі Ш. зліліся з *баптыстамі*.

ШТУРМ (ад ням. Sturm атака, прыступ), 1) спосаб авалодання ўмацаванымі раёнамі ці пазіцыяй праціўніка; у мінулым — імклівая і рашучая атака пяхоты з выкарыстаннем *аблогавай тэхнікі* і знішчэнне абаронцаў у рукапашным баі. Са з'яўленнем агнястрэльнай зброі, асабліва аблогавай артылерыі, распрацавана спец. тактыка сумесных дзеянняў пяхоты, артылерыі і інж. войск для Ш. крэпасці ці горада. Ш. прымяняўся пры ўзяцці рас. войскамі ў 1790 г. Ізмаіл, у 1-ю сусв. вайну авалоданні крэпасцямі Льеж, Перамышль (Пшэмысль) і інш. Ш. называлі некат. баявыя дзеянні Чырв. Арміі пры ўзяцці ўмацаваных гарадоў: Познані, Кёнігсберга (Калінінграда), Берліна і інш. у 2-ю сусв. вайну. Асобныя апорныя пункты, доўгатэрміновыя агнявыя збудаванні, умацаваныя будынкі атакуюцца спецыяльна сфарміраванымі падраздзяленнямі розных родаў войск і спец. войск і загадзя натрэніраванымі штурмавымі групамі або атрадамі. 2) У пераносным сэнсе — рашучыя дзеянні, накіраваныя на дасягненне чаго-н. (напр., Ш. космасу, Ш. навукі і г.д.).

Штурм старажытнага горада на Русі. 10 ст. Малюнак В.Ляхора.

ШТУРМ (Sturm) Жак Шарль Франсуа (29.9.1803, г. Жэнева, Швейцарыя — 18.12.1855), французскі матэматык. Чл. Парыжскай АН (1836), замежны чл.-кар. С.-Пецярбургскай АН (1836). З 1840 праф. Політэхн. школы ў Парыжы. Навук. працы па краявых задачах ураўненняў матэм. фізікі, оптыцы, механіцы. Даследаваў задачу пра пошук уласных значэнняў і ўласных функцый для звычайных дыферэнцыяльных ураўненняў (задача Ш. — Ліувіля). Даў агульны метад вызначэння колькасці каранёў алг. ураўненняў, якія належаць да зададзенага адрэзка (правіла Ш.).

ШТУРМАВІ́К, баявы самалёт, прызначаны для паражэння малапамерных і рухомых наземных (марскіх) цэлей з малых і гранічна малых вышынь. Мае бамбардзіровачнае, ракетнае, артыл. ўзбраенне і бранявую засцярогу. У СССР першы серыйны Ш. — Іл-2 (1939); найб. пашыраны ў Вял. Айч. вайну (выраблена больш за 36 тыс.). Сучасны рас. Ш. Су-25 (1978) мае ўзлётную масу 14,5 т, макс. скорасць 970 км/гадз, практычны паталок 7 км, макс. далёкасць палёту 1250 км; узбраенне — 30-мм двухствольная пушка, ракеты «паветра-зямля» з лазерным навядзеннем, блокі некіруемых ракет і бомбы. З канца 20 ст. на ўзбраенні ВПС некат. інш. краін наступныя Ш.: у ЗША — «Тандэрбалт», у ФРГ і Францыі — «Альфа-Джэт», у Вялікабрытаніі — «Хок».

ШТУРМАВЫ́Я АТРА́ДЫ (ням. Sturmabteilungen, скарочана SA), паўваенныя злучэнні Нацыянал-сацыялістычнай партыі Германіі ў 1921—45. Напачатку выкарыстоўваліся А.Гітлерам як ударная дапаможная сіла пры правядзенні прапагандысцкіх кампаній. З 1923 іх (каля 2 тыс. чал.) узначальваў Г.*Герынг*. Пасля «піўнога путчу» 1923 забаронены, у 1925 адноўлены і сталі масавай арг-цыяй (сац. база — моладзь, беспрацоўныя і інш.). З 1931 узмацнілася іх берлінская арг-цыя на чале з яе нач. штаба Э.Ромам (Рэм). З прыходам да ўлады ў Германіі нацыстаў (1933) Ш.а. — гал. інструмент іх тэрору (у Прусіі з 22.2 да 2.8.1933 выкарыстоўваліся як «дапаможная паліцыя»). У выніку забойства Рома (30.6.1934) і інш. кіраўнікоў, якія прэтэндавалі на лідэрства ў нацысцкай партыі, страцілі паліт. значэнне на карысць *СС*; іх колькасць паменшылася з 4,5 млн. ў чэрв. 1934 да 1,2 млн. чал. у 1938. Пасля разгрому герм. фашызму (1945) Ш.а. забаронены.

У.Я.Калаткоў.

ШТУ́РСА (Štursa) Ян (15.5.1880, г. Нове-Место, Чэхія — 2.5.1925), чэшскі скульптар. Скончыў Пражскую АМ (1903). Зазнаў уплыў сімвалізму. Стварыў статуі, прасякнутыя пачуццёвым успрыняццем прыгажосці чалавечага цела («Ева», 1908), вострадрам. творы («Паранены», 1920—21), манументы і манум.-дэкар. кампазіцыі (групы «Праца» і «Гуманнасць» для Глаўкава моста ў Празе, 1911—13; помнік С.Чэху ў Празе, 1921—22), партрэты. Эмацыянальна насычаная яго творчасць паўплывала на развіццё чэш. скульптуры 20 ст.

ШТУ́ТГАРТ (Stuttgart), горад на ПдЗ Германіі. Адм. ц. зямлі Бадэн-Вюртэмберг. 587 тыс. ж. (1995). Трансп. вузел. Порт на р. Некар. Міжнар. аэрапорт. Буйны прамысл., фін., навук. і культ. цэнтр краіны. Прам-сць: эл.-тэхн., радыёэлектронная, аўтамаб., каляровая металургія, выт-сць рухавікоў, станкаі прыладабудаванне, у т.л. выт-сць фотакінаапаратуры, хім., паліграфічная, тэкст., папяровая, гарбарна-абутковая, харчовая. Цэнтр буйной вобласці пладаводства і вінаробства. Выпрабавальны цэнтр авіяцыі і касм. палётаў. Метрапалітэн. Ун-т. Каля 30 музеяў: краязнаўчы, прыродазнаўчы, «Даймлер-Бенц», «Порш», Дзярж. галерэя (адзін з найбагацейшых збораў твораў Пікасо), вінаградарства, этнаграфіі і інш. Арх. помнікі 12—18 ст.

Кельцкія пасяленні на месцы Ш. вядомы да н.э. Каля 90 н.э. на іх месцы заснаваны стараж.-рым. г. Некарлімес з крэпасцю ў Канштаце. Каля 950 герцаг Луітольф Швабскі пабудаваў тут конны завод і крэпасць. У пісьмовых дакументах Ш. згадваецца каля 1160, гар. правы атрымаў у 1219. З 1321 рэзідэнцыя графаў Вюртэмбергскіх, з 1520 пад панаваннем Аўстрыі. У 1806, у час напалеонаўскіх войнаў, стаў сталіцай новаствонага каралеўства Вюртэмберг. З сярэдзіны 19 ст. ў горадзе інтэнсіўна развівалася прамысловасць. З 1918 Ш. — сталіца зямлі Вюртэмберг, з 1953 — аб'яднанай федэральнай зямлі Бадэн-Вюртэмберг. Ш. — месца нараджэння філосафа Г.В.Ф.Гегеля.

Н.К.Мазоўка.

ШТУФ, кавалак руды або горнай пароды адвольнай формы і невял. памераў (10—20) × (8—10) × (5—6) см (мяняюцца ў залежнасці ад прызначэння), які адбіраецца з руднай залежы або стратыграфічнага гарызонта для лабараторных даследаванняў.

ШТУ́ЦЭР (ад ням. Stutzen літар. — абрэз), 1) укарочаная дульназарадная нарэзная агнястрэльная зброя. Меў павышаную кучнасць і далёкасць стральбы, а з-за цяжкасці зараджання — нізкую скарастрэльнасць. З'явіліся ў 16 ст. ў

Германіі, з 1721 на ўзбраенні ў Расіі. У 2-й пал. 19 ст. заменены *вінтоўкамі*. Ш. наз. таксама некаторыя паляўнічыя наразныя казназарадныя *ружжы* (гл. таксама *Паляўнічая зброя*). 2) Кароткі патрубак (адрэзак трубы) з разьбовымі канцамі для злучэння труб паміж сабою, далучэння іх да трубаправодаў, рэзервуараў, апаратаў і інш.



Рускія **штуцэры**: 1 — кавалерыйскі (узору 1839); 2 — стралковых батальёнаў (узору 1843).

ШТУ́ЧНАЕ АСЕМЯНЕ́ННЕ, прыёмы штучнага збліжэння палавых клетак (у рыб) або штучнае ўвядзенне атрыманай ад вытворніка спермы ў палавыя шляхі самкі з мэтай яе апладнення (у птушак і мелкакормячых). У рыб пры Ш.а. *ікру* змешваюць з малокамі, потым інкубіруюць у натуральных ці штучных умовах. У птушак і млекакормячых сперму ўводзяць пры дапамозе спец. інструментаў у палавыя шляхі самкі. Тэарэт. асновы і прынцыпы практ. прыёмаў Ш.а. с.-г. жывёл распрацаваў у пач. 20 ст. рас. біёлаг І.І.Іваноў; яны засн. на магчымасці атрымання пры дапамозе штучнай похвы спермы самцоў, якая па-за арганізмам не траціць сваіх якасцей, і на магчымасці авуляцыі ў самак с.-г. жывёл без палавога акта.

Складаецца Ш.а. з 5 асн. тэхн. прыёмаў: атрыманне спермы ад самца, ацэнка якасці спермы, яе разбаўленне, захаванне і ўвядзенне ў палавыя органы самкі. У с.-г. жывёл (пераважна коні, буйн. раг. жывёла, авечкі) Ш.а. праводзяць з мэтай інтэнсіўнага выкарыстання высокакаштоўных племянных вытворнікаў, праверaных па якасці патомства, дзеля масавага паляпшэння пародных і прадукц. якасцей жывёл, хуткага атрымання вял. колькасці высакаякаснага патомства. Выкарыстанне Ш.а. папярэджвае распаўсюджванне шэрагу заразных хвароб (бруцэлёз, вібрыёз, трыхаманоз і інш.), якія могуць перадавацца ў выпадку натуральнага асемянення, і некат. формы бясплоддзя. Распрацаваны метады доўгатэрміновага (да некалькіх гадоў) захавання спермы. Ажыццяўляецца Ш.а. праз племпрадпрыемствы (станцыі).

ШТУ́ЧНАЕ ДЫХА́ННЕ, штучная вентыляцыя лёгкіх, дыханне, якім кіруюць, увядзенне паветра ў лёгкія і выдаленне яго адтуль штучнымі метадамі (з выкарыстаннем інструментаў і апаратаў або без іх) для аднаўлення самаст. дыхання пры часовай адсутнасці яго. Адзін з метадаў *рэанімацыі*.

Метады Ш.д.: удзіманне (з роту ў рота, у нос і інш.) і вонкавыя метады змены аб'ёму грудной клеткі, якія рэдка выкарыстоўваюцца (боксавы і кірасны рэспіратары). Ш.д. часам спалучаюць з закрытым масажам сэрца. Асобны від Ш.д. — дыфузнае дыханне (бесперапыннае ўвядзенне кісларoду ў лёгкія праз маску, трубку і інш. пры адсутнасці дыхальных рухаў). Выкарыстоўваецца пры спыненні або недастатковай натуральнай вентыляцыі лёгкіх у выпадках хваробы, траўмы, клінічнай смерці або пры выкананні некат. хірург. аперацый пад наркозам, пры інтэнсіўнай тэрапіі.

І.М.Семяненя.

ШТУ́ЧНАЕ ЛЁГКАЕ, аксігенатар, тэхнічная прылада, якая забяспечвае функцыю *газаабмену* арганізма з навакольным асяроддзем па-за арганізмам. Састаўная ч. апаратаў штучнага кровазвароту і дыхання.

Вылучаюць Ш.л. адна- і шматразовыя, плёначнага, мембраннага і інш. тыпаў, якія складаюцца з розных камер (напр., газаабменнай) і канструкцый. Прынцып работы Ш.л. засн. на ўзаемадзеянні вянознай крыві, якая паступае з арганізма ў газаабменную камеру, са стэрыльным кіслародам, што падаецца туды. Пасля выдалення вугляkіслага газу і лішку кісларoду кроў вяртаецца ў сасудзістае рэчышча з дапамогай помпы. Выкарыстоўваецца пры правядзенні кардыяхірург. аперацый, рэанімацыі, інтэнсіўнай тэрапіі.

І.М.Семяненя.

ШТУ́ЧНАЯ НЫ́РКА, адзін з найб. пашыраных *штучных органаў і апаратаў* для пазаарганізмавага ачышчэння крыві (выдалення прадуктаў абмену рэчываў, таксінаў, падтрымання водна-электралітнага і кіслотна-шчолачнага балансу).

У Ш.н. кроў паступае з артэрыі (напр., праз катэтар), дзе яна праходзіць сістэму трубак, поласцей з паўпранікальнай мембраны, якія абмываюцца спец. растворам. Потым кроў вяртаецца ў вянознае рэчышча. Работа Ш.н. засн. на *гемадыялізе* і *ультрафільтрацыі*. Усе апараты Ш.н. складаюцца з дыялізатара, перфузійнай прылады (катэтары, помпы і інш.) для руху крыві наперад, канструкцыі для прыгатавання і падачы ў дыялізатар дыялізуючага раствору і манітора. Выкарыстоўваецца пры вострай і хранічнай *ныркавай недастатковасці*. З дапамогай Ш.н. (апарат падключаецца перыядычна) жыццё хворага можа падтрымліваца некалькі гадоў. *І.М.Семяненя.*

ШТУ́ЧНАЯ ПЛАНЕ́ТА, тое, што *штучны спадарожнік Сонца*.



Штучнае дыханне: 1 — з рота ў рот; 2 — з рота ў нос.

ШТУ́ЧНЫ АДБО́Р, выбар чалавекам найб. каштоўных у гасп. адносінах жывёл і раслін дадзенага віду, пароды ці сорту для атрымання ад іх патомства з пажаданымі ўласцівасцямі. Асновы тэорыі распрацаваў Ч.Р.*Дарвін* (1859), які выявіў, што Ш.а. з'яўляўся асн. фактарам пры ўзнікненні парод свойскай жывёлы і сартоў с.-г. раслін. Несвядомы Ш.а. ужо адбываўся на першых этапах адамашнівання чалавекам жывёл і акультурвання раслін. Метадычны Ш.а. (*селекцыя*) сфарміраваўся ў 2-й пал. 18 ст. Існуюць 2 формы метадычнага адбору. Пры масавым Ш.а. выбракоўваюць усе асобіны паводле *фенатыпу*, якія не адпавядаюць пародным або сартавым стандартам, з мэтай захавання пародных і сартавых якасцей. Індывідуальны Ш.а. — адбор асобін з улікам спадчыннай стойкасці іх адзнак (паводле *генатыпу*), што забяспечвае ўдасканальванне пародных і сартавых якасцей. У адрозненне ад *натуральнага адбору* Ш.а. ажыццяўляецца чалавекам па асобных адзнаках, таму часам адбываецца распадзенне генет. і морфагенет. карэляцыйных сістэм арганізма з выяўленнем фенатыпічнага эфекту генаў, якія раней былі блакіраваны ўздзеяннем генаў-рэпрэсараў у саставе адпаведных генет. комплексаў. У выніку фенатыпічная зменлівасць арганізмаў павышаецца, а агульная жыццяздольнасць паніжаецца. Метадычны Ш.а. выкарыстоўваецца ў жывёлагадоўлі і раслінаводстве.

Літ.: Проблемы доместикации животных и растений. М., 1972. *Р.Г.Заяц.*

ШТУ́ЧНЫ СПАДАРО́ЖНІК ЗЯМЛІ́ (ШСЗ), *касмічны апарат* (КА), выведзены на арбіту вакол Зямлі. У адпаведнасці з міжнар. дамоўленасцю касм. апарат наз. ШСЗ, калі ён зрабіў не менш як 1 абарот вакол Зямлі. Каб цела стала ШСЗ, яму трэба надаць 1-ю *касмічную скорасць*, што дасягаецца пры дапамозе *ракет-носьбітаў*.

Першы ў свеце ШСЗ («Спадарожнік-1») створаны ў СССР і запушчаны 4.10.1957 з касмадрома Байканур; 1.2.1958 на арбіту выведзены першы амер. ШСЗ («Эксплорэр-1»). ШСЗ стварылі яшчэ 36 краін і шэраг міжнар. арганізацый. Але толькі 8 краін і *Еўрапейскае касмічнае агенцтва* маюць уласныя ракеты-носьбіты для запуску ШСЗ і лічацца касм.

дзяржавамі. Усяго на пач. 2003 ШСЗ сталі каля 5000 КА. Адрозніваюць ШСЗ: аўтаматычныя, пілатуемыя і *арбітальныя станцыі* (АС). Аўтаматычныя ШСЗ падзяляюцца на эксперыментальныя (адпрацоўка канструкцый КА; напр., *«Космас», «Палёт»)*, навукова-даследчыя (даследаванне Зямлі і каляземнай прасторы, астр., медыкабіял. даследаванні і інш.; напр., *«Авангард», «Арыябхата», «Астрон», «Інтэркосмас», «Прагноз», «Пратон», «Эксплорэр», «Электрон», Хабла тэлескоп, «Чандра»* і інш.), прыкладныя (метэаралагічныя, геад., спадарожнікі сувязі, для даследавання прыродных рэсурсаў, экалагічнага маніторынгу і інш.; напр.: *«Лэндсэт», «Маланка», «Метэор», «Экран»)*. ШСЗ ажыццяўляюць кантроль за выкананнем міжнар. пагадненняў, збіраюць інфармацыю ў інтарэсах мін-ваў абароны і інш. Пілатуемыя ШСЗ і арбітальныя станцыі прызначаны для палёту чалавека. Першы ў свеце пілатуемы ШСЗ — *«Усход»* (гл. таксама *«Джэміні», «Меркурый», «Саюз», «Спейс шатл», «Узыход»*). Першая ў свеце эксперым. АС створана 16.1.1969 стыкоўкай на арбіце караблёў «Саюз-4» і «Саюз-5»; доўгачасовая сав. АС *«Салют»* выведзена на арбіту 19.4.1971. Гл. таксама *«Скайлэб», «Мір», Касманаўтыка.*

Літ.: Аксенов Е.П. Теория движения искусственных спутников Земли. М., 1977; Келдыш М.В., Маров М.Я. Космические исследования. М., 1981; Максимов А.И. Космическая одиссея. Новосибирск, 1991.

У.С.Ларыёнаў.

ШТУ́ЧНЫЯ МО́ВЫ, знакавыя сістэмы, структура, мэты і правілы выкарыстання якіх вызначаюцца чалавекам. У залежнасці ад ступені сканструяванасці падзяляюцца на некалькі відаў. Неспецыялізаваныя Ш.м. агульнага прызначэння ў найб. ступені падобныя да натуральных (*эсперанта*, валапюк, іда, інтэрлінгва, акцыдэнталь і інш.). Спецыялізаваныя Ш.м. — сімвалічныя мовы розных навук (матэматыкі, хіміі, логікі, лінгвістыкі і інш.), а таксама знакавыя сістэмы для сувязі чалавека з ЭВМ, або *мовы праграмавання (фартран*, алгол, кобала і інш.). Да гэтай групы належаць і т.зв. інфармацыйна-пошукавыя мовы, якія грунтуюцца на адпаведных *тэзаўрусах*. Асобную групу складаюць мадыфікацыі натуральных моў, што адрозніваюцца мэтанакіраванымі зменамі ў сістэмна-структурнай арганізацыі гэтых моў (літ. мовы, сац. дыялекты розных тыпаў). Да Ш.м. адносяць і шматлікія дапаможныя знакавыя сістэмы: *жэстаў мовы*, мовы дарожных сігналізацый, крыптаграфічныя сістэмы (гл. *Пазіграфія*. Стварэнне Ш.м. абумоўлена шматлікімі і разнастайнымі камунікацыйнымі патрэбамі грамадства. Распрацоўка і стварэнне новых Ш.м. дазваляе глыбей асэнсаваць семіялагічныя законы будовы і фукцыянавання мовы ўвогуле і ўзмацніць кантроль чалавека за выкарыстаннем сродкаў камунікацыі.

Літ.: Морозов В.П., Ежова Л.Ф. Алгоритмические языки. М., 1975; Проблемы интерлингвистики. М., 1976; Михневич А.Е. Язык, которого нет... Мн., 1988.

А.Я.Міхневіч.

ШТУ́ЧНЫЯ О́РГАНЫ І АПАРА́ТЫ, устройствы, створаныя на аснове дасягненняў *біятэхналогіі*, мікрарадыёэлектронікі і інш. для пастаяннай ці часовай замены парушаных або страчаных функцый унутр. органаў. Да іх адносяцца *штучнае лёгкае, штучная нырка*, штучнае сэрца, штучныя жалудачкі і клапаны сэрца, штучная печань, апараты штучнага кровазвароту, біясенсары і інш.



Да арт. **Штучныя органы і апараты.** Схема апарата штучнага кровазвароту: 1 — аорта; 2 — артэрыяльная лінія; 3 — мікрафільтр; 4 — артэрыяльная помпа; 5 — аксігенатар; 6 — вянозная лінія; 7 — ніжняя полая вена; 8 — верхняя полая вена.

Падзяляюцца на часткова або цалкам імплантаваныя ў арганізм (напр., штучнае сэрца) і тыя, што не імплантуюцца (напр., апараты штучнага кровазвароту); на ўстройствы, якія падтрымліваюць жыццядзейнасць арганізма толькі пры бесперапынным функцыянаванні (штучнае сэрца) ці пры іх перыяд. падключэнні (штучная нырка). Для Ш.о. і а. выкарыстоўваюць біясумяшчальныя матэрыялы (мадыфікаваны тэфлон, нікелід тытану і інш.), якія маюць высокую стабільнасць фіз.-хім. уласцівасцей і магчымасць кіравання формай штучнага органа ў арганізме хворага. Яны павінны быць інертнымі, не выклікаць рэакцыі адчужэння, запалення, згусання крыві. Для лячэння скурных пашкоджанняў выкарыстоўваюць штучную скуру на аснове прыроднага *калагену*; распрацавана штучная храстковая тканка. Для лячэння неўралагічных і нейрахірург. захворванняў выкарыстоўваюць штучныя нерв. валокны, атрыманыя з культур няспелай нерв. тканкі. Створаны асновы для біятэхнал. замены касцявой тканкі, сухажылляў, касцявога мозгу і інш.

І.М.Семяненя, А.Р.Давыдоўскі.

ШТУ́ЧНЫЯ СПАДАРО́ЖНІКІ МЕ́СЯЦА (ШСМ), *касмічныя апараты* (КА), выведзеныя на арбіты вакол *Месяца* для даследавання Месяца і калямесяцавай прасторы.

Першым у свеце ШСМ стала сав. *аўтаматычная міжпланетная станцыя* (АМС) «Месяц-10», запушчаная 31.3.1966 (гл. *«Месяц»*). У 1966—74 на калямесяцавыя арбіты выведзены АМС «Месяц-11», «Месяц-12», «Месяц-14», «Месяц-19» «Месяц-22». ШСМ сталі амер. АМС *«Лунар орбітэр», «Эксплорэр»*, «Клементіна» (запушчаны 26.1.1994), «Лунар проспектар» (запушчаны 6.1.1998), яп. АМС «Мюзес-А» (запушчана 24.1.1990). На арбіты вакол Месяца выходзілі амер. пілатуемыя касм. караблі ў час рэалізацыі праграмы *«Апалон»*. Пры дапамозе ШСМ складзены карты Месяца, даследавана глабальная структура гравітацыйнага поля, праведзены вымярэн-



Першы **штучны спадарожнік Месяца** — савецкая аўтаматычная міжпланетная станцыя «Месяц-10».

Штучныя спадарожнікі планет

Назва планеты	Назва спадарожніка (АМС)	Краіна	Дата выведзення на арбіту
Венера	«Венера-9»	СССР	22.10.1975
	«Венера-10»	СССР	25.10.1975
	«Піянер-Венера-1»	ЗША	4.12.1978
	«Венера-15»	СССР	10.10.1983
	«Венера-16»	СССР	14.10.1983
	«Магелан»	ЗША	10.8.1990
Марс	«Марынер-9»	ЗША	14.11.1971
	«Марс-3»	СССР	2.12.1971
	«Марс-5»	СССР	12.2.1974
	«Вікінг-1»	ЗША	19.6.1976
	«Вікінг-2»	ЗША	7.8.1976
	«Фобас-2»	СССР	29.1.1989
	«Марс глоўбэл сервеер»	ЗША	11.9.1997
	«Марс Адысей»	ЗША	24.10.2001
Юпітэр	«Галілеа»	ЗША	7.12.1995
Эрас (Малая планета)	«NEAR»	ЗША	14.2.2000

ні магн. поля і даследаванні грунту Месяца.

Літ.: Уманский С.П. Луна — седьмой континент. М., 1989. *У.С.Ларыёнаў.*

ШТУ́ЧНЫЯ СПАДАРО́ЖНІКІ ПЛАНЕ́Т (ШСП), *касмічныя апараты* (КА), выведзеныя на арбіты вакол *планет* Сонечнай сістэмы і *малых планет* (астэроідаў). Прызначаны для даследавання гэтых нябесных цел і іх спадарожнікаў. Спачатку КА выводзіцца на геліяцэнтрычную арбіту і рухаецца па ёй, потым у выніку тармажэння становіцца ШСП. Гл. табліцу, а таксама *«Венера»*, *«Вікінг»*, *«Марс»*, *«Марынер»*; *«Піянер»*. Аўтам. міжпланетная станцыя *«Касіні»* будзе выведзена на арбіту штучнага спадарожніка планеты Сатурн 1.7.2004. *У.С.Ларыёнаў.*

ШТУ́ЧНЫЯ СПАДАРО́ЖНІКІ СО́НЦА (ШСС), *касмічныя апараты* (КА), выведзеныя на арбіты вакол *Сонца*. Каб цела стала ШСС, яму трэба надаць скорасць адносна Зямлі не менш 2-й і не больш 3-й *касмічнай скорасці*, што дасягаецца пры дапамозе *ракет-носьбітаў*. ШСС выкарыстоўваюцца для даследавання Сонца і калясонечнай прасторы, планет Сонечнай сістэмы і іх спадарожнікаў, астэроідаў, камет, метэорных цел, міжпланетнай прасторы (КА выводзіцца на геліяцэнтрычную арбіту і рухаецца па ёй да аб'екта даследавання). Першым у свеце ШСС стала сав. *аўтаматычная міжпланетная станцыя* «Месяц-1», запушчаная 2.1.1959. Гл. таксама *«Вега»*, *«Венера»*, *«Геліяс»*, *«Зонд»*, *«Марс»*, *«Марынер»*, *«Месяц»*, *«Піянер»*, *«Уліс»*, *«Эксплорэр»*. *У.С.Ларыёнаў.*

ШТЫК (польск. sztych), 1) колючая і колюча-рэжучая *халодная зброя*, якая мацавалася (устаўлялася або насаджвалася) на канцы ствала ружжа (з 19 ст. вінтоўкі, карабіна, аўтамата); прызначалася для штыкавога (рукапашнага) бою. З'явіўся ў сярэдзіне 17 ст. ў Францыі пад назвай *баянет* (багінет); першапачаткова ўяўляў сабой укарочанае кап'ё, дрэўка якога ўстаўлялася ў ствол ружжа. З канца 17 ст. іх рабілі цэльнаметалічнымі з трубкай, якую насаджвалі на ствол (гэта дазваляла весці зараджанне і стральбу з прымкнутым Ш.). Адрозніваюць Ш. гранёныя (3- і 4-гранныя), клінковыя (двухбаковавострыя Ш. — кінжалы, Ш.-цесакі), адналязовыя (Ш.-нажы), аддымныя і неаддымныя. 2) Узброены салдат (як адзінка падліку пяхоты). 3) Пласт зямлі на глыбіню палатна рыдлёўкі.

Ц.Ф.Штыкоў.

ШТЫКО́Ў Цярэнцій Фаміч (13.3.1907, хутар Любкі Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл. — 25.10.1964), савецкі, парт. і дзярж. дзеяч, дыпламат, ген.-палкоўнік (1944). З 1931 на камсам., парт. і сав. рабоце ў Ленінградзе. У 1938—42 2-гі сакратар Ленінградскага абкома ВКП(б). У Вял. Айч. вайну чл. ваеннага савета Ленінградскага, Волхаўскага, Карэльскага, 1-га Далёкаўсх. франтоў, Прыморскай групы войск. Пасля вайны чл. Ваен. савета, нам. камандуючага войскамі Прыморскай ваен. акругі. У 1948—51 надзвычайны і паўнамоцны пасол СССР у КНДР. У 1959—61 у Венгрыі. У 1951—59 на парт. рабоце: 1-ы сакратар Наўгародскага абкома, Пры-



Да арт. **Штык**: 1 — багінет (пач. 18 ст.); 2 — ігольчаты чатырохгранны да вінтоўкі ўзору 1891/30 (СССР); 3 — адкідны няздымны да карабіна СКС (СССР); 4 — да аўтамата АКМ, які выкарыстоўваецца таксама як разак для дроту і піла (СССР); 5 — сапёрны ўзору 02 да вінтовак Маўзера (Германія); 6 — да вінтовак Арысака (Японія); 7 — да вінтоўкі FN 1949 (Бельгія); 8 — заходнегерманскі да вінтоўкі G-3 (прынята на ўзбраенне ў Данії); 9 — да вінтоўкі М-16 (ЗША).

морскага крайкома КПСС. Потым у органах парт.-дзярж. кантролю. Чл. ЦК КПСС у 1956—61. Дэп. Вярх. Савета СССР у 1937—50, 1954—62.

ШТЫК-ЮНКЕР, першы малодшы афіцэрскі чын (званне) у артылерыі рас. арміі. Уведзены ў 1712 для афіцэраў артыл. узводаў і роўных ім па пасадзе асоб. Адпавядаў званню *падпаручніка* ў пяхоце. Паводле *Табеля аб рангах* адносіўся да 13-га класа. У 1811 званне Ш.-ю. заменена на званне *прапаршчык*.

ШТЫЛЬ (галанд. stil), 1) бязветранасць або слабы вецер, скорасць якога па Бофарта шкале не перавышае 0,5 м/с. Назіраецца звычайна ва ўнутр. ч. антыцыклонаў, у барычных седлавінах. У далінах і катлавінах узнікае часцей, чым на адкрытай мясцовасці са свабоднай цыркуляцыяй атмасферы. 2) Стан мора, пры якім на яго паверхні адсутнічаюць *ветравыя хвалі*.

ШТЫ́РБУ, Штырбул Кірыл Антонавіч (2.3.1915, с. Браштэнь Рыбніцкага р-на, Малдова — 28.8.1997)), малдаўскі акцёр. Нар. арт. СССР (1960). Скончыў Адэскае тэатр. вучылішча (1937). Працаваў у Ціраспальскім, з 1940 у Кішынёўскім малд. муз.-драм. т-рах. Самабытны, шматгранны акцёр шырокага творчага дыяпазону, схільны да вострай сцэн. формы. Сярод роляў: Стропша («Свет» А.Лупана), Іон («Марыйчына шчасце» Л.Карняну), Бурус («Авідзій» В.Александры), Гараднічы («Рэвізор» М.Гогаля), кароль Лір («Кароль Лір» У.Шэкспіра), Швейк («Швейк у другой сусветнай вайне» Б.Брэхта), Швандзя («Любоў Яравая» К.Транёва) і інш. Здымаўся ў кіно.

ШТЫ́РНЕР (Stimer) Макс [сапр. Шміт (Schmidt) Каспар; 25.10.1806 г. Байройт, Германія — 26.6.1856], нямецкі філосаф-младагегельянец, тэарэтык *анархізму*. У кн. «Адзіны і яго ўласнасць» (1845) развіў суб'ектыўна-ідэаліст. версію младагегельянства (гл. *Гегельянства*) у антрапалогіі, этыцы і праве. Асн. яго ідэя ў тым, што сац. якасці чалавека — гэта нешта ўсеагульнае, а кожная эмпірычная асоба адзінкавая; таму ўсё, што тычыцца чалавека наогул, не адносіцца да канкрэтнага («адзінага») чалавека. Лічыў, што паняцці «чалавек», «права», «мараль» і да т.п. — гэта адчужаныя формы індывід. свядомасці («здані»), таму асоба не можа прызнаваць ніякіх абавязацельных для сябе грамадскіх установак. У выніку прыйшоў да высновы, што першакрыніцы сапраўдных правоў і маралі — сіла і магутнасць канкрэтнай асобы, адной з форм рэалізацыі якой з'яўляецца прыватная ўласнасць. На яго думку, намаганні індывіда павінны накіроўвацца на пошук сваёй уласнай свабоды, а не свабоды для ўсіх, таму што за ўсімі сац. ўтварэннямі заўсёды хаваюцца эгаістычныя інтарэсы канкрэтных асоб. *А.Б.Савеня.*

ШТЫ́ХАЎ Георгій Васілевіч (н. 14.7.1927, в. Старая Беліца Гомельскага р-на), бел. археолаг і гісторык-медыявіст. Д-р гіст. н. (1983), праф. (1989). Скончыў БДУ (1956). З 1962 у Ін-це гісторыі Нац. АН Беларусі (з 1981 заг. сектара, у 1988—2000 заг. аддзела). Вывучае стараж. гарады Полацкай зямлі і курганныя могільнікі ранняга сярэдневякоўя паўн. і цэнтр. Беларусі. З 1982 узначальвае пастаянна дзеючую экспедыцыю па даследаванні стараж. Мінска. Узначальваў экспедыцыі па вывучэнні Полацка, Віцебска, Заслаўя, Барысава, Лукомля, Лагойска, Копысі. Правёў шырокае даследаванне гэтых гарадоў, выявіў гарадзішча стараж. Барысава, правёў раскопкі паселішча на р. Менка, даследаваў больш за 300 курганоў Полацкай зямлі, у т.л. *доўгіх курганоў*. Вывучаў могільнікі 3-й чвэрці 1-га тыс. н.э., сінхронныя гарадзішчам *банцараўскай культуры*. Зрабіў вывад, што фарміраванне зах. галіны *крывічоў* адбывалася на працягу 2-й пал. 1-га тыс. н.э., што гіст. ядром Полацкай зямлі з'яўлялася Падзвінне. Даследаваў стараж. скульптуру, дробную пластыку гарадоў Полацкай зямлі, скарбы сярэбраных і залатых рэчаў (Полацкія 11—12 ст., Гараўлянскі 11 ст.). Адзін з аўтараў кніг «Старажытныя гарады Беларусі» (з П.Ф.Лысенкам, 1966), «Старажытныя скарбы Беларусі» (з П.М.Захаранкам, 1971), «Гісторыя Беларускай ССР» (т. 1, 1972), «Нарысы па археалогіі Беларусі» (ч. 2, 1972), «Гісторыя Беларускай ССР» (1977), «Кіеў і заходнія землі Русі ў IX—XIII стст.» (1982), «Беларуская археалогія» (1987), «Нарысы гісторыі Беларусі» (ч. 1, 1994), «Гісторыя сялянства Беларусі» (т. 1, 1997), «Археалогія Беларусі» (т. 2—3, 1999—2000), «Гісторыя Беларусі» (т. 1, 2000), адзін з аўтараў і навук. рэдактараў кнігі «Памяць: Полацк» (2002). Аўтар школьных падручнікаў і дапаможнікаў па гісторыі Беларусі, складальнік «Дакументаў і матэрыялаў па гісторыі Беларусі ў сярэднія вякі (VI—XV стст.)» (1998). Дзярж. прэмія Рэспублікі Беларусь (1990).

Тв.: Галасы далёкіх продкаў. Мн., 1968; Древний Полоцк, IX—XIII вв. Мн., 1975; Города Белоруссии по летописям и раскопкам (IX—XIII вв.). Мн., 1975; Города Полоцкой земли (IX—XIII вв.). Мн., 1978; Ажываюць сівыя стагоддзі. 2 выд. Мн., 1982; Крывічы: Па матэрыялах раскопак курганоў у Паўночнай Беларусі. Мн., 1992; Гісторыя Беларусі: Кароткі нарыс: У 5 ч. Ч. 1. Мн., 1993; Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі. 2 выд. Мн., 2002; Дзевяць стагоддзяў Барысава. Мн., 2002 (у сааўт.).

Літ.: Г.В.Штыхаў: (Да 75-годдзя з дня нараджэння). Мн., 2002. *Т.М.Каробушкіна.*

Г.В.Штыхаў.

С.А.Штэйн.

ШТЭЙН (ад ням. Stein камень) у металургіі, злучэнне *сульфіду* некаторых каляровых металаў (пераважна медзі, нікелю) з сульфідам жалеза; прамежкавы прадукт (паўпрадукт) выплаўкі гэтых металаў з іх сульфідных (сярністых) руд і рудных канцэнтратаў. Ш. у *канвертары* прадзімаюць тэхн. кіслародам або паветрам і атрымліваюць чарнавы (з дамешкамі) каляровы метал, які ў далейшым ачышчаюць (гл. *Рафінаванне*).

ШТЭЙН Аляксандр Пятровіч (28.9.1906, г. Самарканд, Узбекістан — 5.10.1993), рускі драматург. Пісаў на марскую тэматыку. З 1923 выступаў у друку як журналіст. П'есы «Вясна дваццаць першага» (1939), «Флаг адмірала» (паст. 1950; Дзярж. прэмія СССР 1951) на ваен.-гіст. і рэв. тэмы. П'есы «Персанальная справа» (паст. 1954), «Акіян» (паст. 1961), «Апладысменты» (паст. 1967), «Жыў-быў Я» (1977) і інш. пра сучаснасць. Аўтар літ.-біягр. драм «У палоне часу» (1970), «Версія» (1976), кінасцэнарыяў «Суд гонару» (1948; Дзярж. прэмія СССР 1949), кн. «Аповесць пра тое, як узнікаюць сюжэты» (кн. 1—2, 1965—76), дакумент. кн. «Неба ў дыяментах» (1976), апавяданняў, успамінаў і інш. П'есы Ш. ставіліся ў т-рах Беларусі: «Персанальная справа» ў Дзярж. рус. драм. т-ры і Бел. т-ры імя Я.Коласа (абедзве 1955), «Акіян» у рус. т-ры (1961) і інш.

Тв.: Пьесы. Т. 1—2. М., 1978.

ШТЭЙН Сямён Аляксандравіч (Саламон Абрамавіч; 7.1.1928, г. Самара, Расія — 25.8.1993), бел. рэжысёр оперы. Засл. дз. маст. Расіі (1969). Нар. арт. Беларусі (1977).Скончыў Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва (1953). Працаваў у Куйбышаўскім, Варонежскім, Новасібірскім т-рах оперы і балета. З 1970 рэжысёр Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Адначасова (з 1975) выкладаў у Бел. кансерваторыі. Яго творчасць вызначалася грамадзянскасцю, сучаснасцю мыслення, глыбокім спасціжэннем муз.-драматургічных асаблівасцей твора і дакладнай псіхал. распрацоўкай роляў, выразнасцю сцэн. формы. На бел. сцэне здзейсніў шэраг пастановак класічных і сучасных опер: «Залаты пеўнік» М.Рымскага-Корсакава (1971), «Фауст» Ш.Гуно (1972), «Сельскі гонар» П.Масканьі, «Міндыя» А.Тактакішвілі (абедзве 1973), «Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага (1974), «У буру» Ц.Хрэннікава (1975), «Пікавая дама» П.Чайкоўскага (1983), «Вайна і мір» (1985), «Мадалена» (1989) С.Пракоф'ева, «Баль-маскарад» Дж. Вердзі

(1988) і інш. Творчая зацікаўленасць Ш. ў развіцці бел. оперы выявілася ў яго працы над спектаклямі «Зорка Венера» (1970), «Новая зямля» (1982) Ю.Семянякі, «Джардана Бруна» С.Картэса (1977), «Сівая легенда» Дз.Смольскага (1978), «Сцежкаю жыцця» Г.Вагнера (1980), «Князь Навагрудскі» А.Бандарэнкі (1992). Сааўтар лібрэта опер «Сцежкаю жыцця», «Матуха Кураж» Картэса. Ставіў спектаклі ў Вял. т-ры ў Маскве («А досвіткі тут ціхія...» К.Малчанава, 1975; «Баль-маскарад», 1979; «Сельскі гонар», «Паяцы» Р.Леанкавала, абодва 1985; «Фауст», 1992), Ленінградскім т-ры оперы і балета («Сіла лёсу» Вердзі, 1985), оперных т-рах Сафіі («А досвіткі тут ціхія...», 1976; «Заручыны ў манастыры» С.Пракоф'ева, 1991), Плоўдзіва (Балгарыя; «Зара» Малчанава, 1961) і інш. У Дзярж. т-ры муз. камедыі Беларусі паставіў аперэты «Паўлінка» (1973), «Тыдзень вечнага кахання» (1975), «Сцяпан — вялікі пан» (1979) Семянякі, «Ноч у Венецыі» (1983) І.Штрауса, мюзікл «Мая цудоўная лэдзі» Ф.Лоу (1982). Выступаў па праблемах опернага мастацтва ў друку, на тэлебачанні і радыё.

Тв.: Заметки о режиссуре // Муз. академия. 1994. № 4. *А.А.Саламаха.*

ШТЭ́ЙНБЕРГ Дж., гл. *Стэйнбергер Дж.*

ШТЭ́ЙНБЕРГ Леў Пятровіч (15.9.1870, г. Днепрапятроўск, Украіна — 16.1.1945), расійскі дырыжор, кампазітар. Нар. арт. СССР (1937). Праф. (1938). Скончыў Пецярбургскую кансерваторыю (1893). Вучань М.*Рымскага-Корсакава.* Працаваў у оперных т-рах Пецярбурга, Масквы і інш. Удзельнічаў у «Рус. сезонах» С.Дзягілева. З 1928 дырыжор Вял. т-ра ў Маскве. У 1934—37 пастаянны шэфкансультант сімф. аркестра Бел. радыёцэнтра. Выступаў як сімф. і оперны дырыжор. Сярод твораў: балет «Міра» (паст. 1924), муз. хроніка «Джон Рыд» (1932), кантаты і інш.

ШТЭ́ЙНЕР Іван Фёдаравіч (н. 10.9.1953, в. Беражное Столінскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. літаратуразнавец. Д-р філал. н. (1994), праф. (1995). Скончыў БДУ (1975). Настаўнічаў. З 1981 выкладае ў Гомельскім ун-це (з 1983 заг. кафедры). Даследуе бел. баладу ў яе сувязях з нар. і літ. традыцыямі слав. народаў, сучасную бел. л-ру ў слав. і еўрап. кантэксце, фальклор. Аўтар манаграфій «Беларуская балада: Вытокі жанру і паэтычная структура» (1989), «Варожасць балады вякоў: Беларуская балада і славянскія традыцыі» (1993), «Шматмоўная літаратура Беларусі XIX ст.» (2002), вучэбных дапаможнікаў. Сааўтар зб-каў «Таямніцы замоўнага слова» (1997), «Сцэнізацыя фальклорных свят і абрадаў» (1999), «Роднае: Фальклорна-этнаграфічная і літаратурная спадчына Гомельскага раёна» (2000), «Фальклорна-этнаграфічная і літаратурная спадчына Рэчыцкага раёна» (2002), «Вяселле на Гомельшчыне: Фальклорна-этнаграфічны зборнік» і «Народная міфалогія Гомельшчыны» (абедзве 2003; усе з В.Новак).

Тв.: «Душа прычаліцца крылом да неба...» Гомель, 1999. *А.І.Клімовіч.*

ШТЭ́ЛЕР Павел Паўлавіч (14.1.1910, С.-Пецярбург — 4.2.1977), расійскі архітэктар. Засл. арх. Расіі (1971). Скончыў Ленінградскую АМ (1936). Асн. работы ў Маскве: гасцініца «Савецкая» (1950, Дзярж. прэмія СССР 1951), станцыя метрапалітэна «Праспект Міру» (1957), Палац з'ездаў (цяпер Крамлёўскі палац, 1959—61, Ленінская прэмія 1962), будынкі Савета Міністраў Расіі (цяпер Дом урада Расіі, т.зв. Белы дом; 1965—79), комплекс гасцініцы «Расія» (1967—70) з Цэнтр. канцэртнай залай «Расія» (1974, усе ў сааўт.). З 1968 кіраваў аўтарскім калектывам па праектаванні Навакіраўскага праспекта ў Маскве (цяпер праспект А.Дз.Сахарава).

Літ.: Левинская Е.Н. П.Штеллер // Зодчие Москвы. М., 1988. Кн. 2.

ШТЭРН (Stern) Ота (17.2.1888, Зораў, Германія — 17.8.1969), нямецкі і амерыканскі фізік. Чл. Нац. АН ЗША (1945). Скончыў ун-т у г. Брэслаў (цяпер Вроцлаў, Польшча). З 1933 у ЗША. Праф. тэхнал. ін-та ў Пітсбургу (з 1933) і Каліфарнійскага ун-та ў Берклі (з 1946). Навук. працы па малекулярнай, атамнай і ядз. фізіцы, квантавай тэорыі. Упершыню вызначыў скорасць малекул газу (1920; дослед Ш.). Даказаў наяўнасць магн. моманту ў атамаў (з ням. фізікам В.Герлахам; гл. *Штэрна — Герлаха дослед*). Вызначыў магн. момант пратона (з ням. фізікам Р.Фрышам). Нобелеўская прэмія 1943.

ШТЭ́РНА — ГЕ́РЛАХА ДО́СЛЕД, эксперымент, які выявіў наяўнасць у атама магнітнага моманту з дыскрэтным значэннем праекцый на напрамак знешняга магн. поля. Прапанаваны П.Л.*Капіцай* і М.М.*Сямёнавым*, пастаўлены ням. фізікамі О.*Штэрнам* і В.Герлахам у 1922. Вузкі пучок атамаў серабра, які праходзіў праз вобласць неаднароднага магн. поля, падзяляўся на 2 пучкі, што пацвердзіла існаванне прасторавага квантавання магн. моманту атамаў. Лікавыя значэнні магн. моманту, вызначаныя ў Ш. — Г.д., аказаліся кратнымі *магнетону* Бора.

ШТЭ́РНБЕРГ Павел Карлавіч (2.4.1865, г. Арол, Расія — 1.2.1920), расійскі астраном і рэвалюцыянер. Скончыў Маскоўскі ун-т (1887). У 1888—1917 у Маскоўскай астр. абсерваторыі (з 1916 дырэктар); адначасова з 1890 у Маскоўскім ун-це (з 1914 праф.) Пасля Лют. рэв. 1917 Ш. — адзін з арганізатараў і кіраўнік баявых рабочых дружын Масквы, пазней на парт. рабоце. Навук. працы па гравіметрыі і фатагр. астраметрыі. Даследаваў рух зямных полюсаў. Адзін з першых выкарыстаў фатаграфію для вывучэння падвойных зорак. Яго імем названы Дзярж. астранамічны ін-т пры Маскоўскім ун-це (1931).

Літ.: Перель Ю.Г. Выдающиеся русские астрономы. М.; Л., 1951. С. 141—175; Куликовский П.Г. П.К.Штернберг. М., 1965.

А.І.Шуба.

ШУА́НЫ (франц. chouans, паводле пашыранай версіі ад chat-huant сава, крык якой капіравалі шуаны, падаючы ўмоўныя сігналы), раялісцкія паўстанцы (сяляне, дваране, апазіц. духавенства), якія дзейнічалі на ПнЗ Францыі ў 1792—1803 у час *Французскай рэвалюцыі 1789—99* і *Консульства*. Кіраўнік (з канца 1793) — сын селяніна Ж.Кадудаль, але ідэйнае кіраўніцтва належала дробнамаянтковым дваранам і святарам. Выступалі за аднаўленне манархіі *Бурбонаў*, супраць абмежавання рыначных цэн на харчаванне, ваен. рэквізіцый, мабілізацыі сялян у армію і інш. захадаў рэсп. урадаў. Карысталіся падтрымкай Вялікабрытаніі і контррэв. эмігрантаў. Удзельнічалі ў *вандэйскіх войнах*, у т.л. падтрымалі высадку эмігрантаў на п-ве Кіберон у Брэтані ў чэрв.—ліп. 1795. Нягледзячы на паражэнні, Ш. змагаліся да 1803, калі іх рух быў канчаткова задушаны. Кадудаль у 1804 пакараны смерцю за арганізацыю замахаў на Напалеона I.

ШУ́БА Аляксей Іванавіч (25.2.1912, в. Падарэссе Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл. — 26.12.1971), адзін з арганізатараў лячэбна-прафілакт. дапамогі на Беларусі. Герой Сац. Працы (1969). Засл. ўрач Беларусі (1948). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1939). У Вял. Айч. вайну адзін з кіраўнікоў партыз. руху (з 1941) у Мінскай вобл., камандзір 100-й партыз. брыгады імя С.М.Кірава (1943). З 1944 заг. аддзела аховы здароўя выканкома Мінскага гар. Савета дэпутатаў працоўных, з 1950 у Мінскім мед. ін-це; у 1952—71 гал. ўрач 1-й клінічнай бальніцы г. Мінска.

ШУ́БА Павел Паўлавіч (15.1.1926, в. Танежыцы Слуцкага р-на Мінскай вобл. — 4.9.2000), бел. мовазнавец. Д-р філал. н. (1972), праф. (1973). Засл. дз. нав. Беларусі (1982). Акад. Бел. акадэміі адукацыі (1999). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1951). З 1955 у Ін-це мовазнаўства АН Беларусі, з 1961 у БДУ (з 1974 заг. кафедры). Даследаваў граматыку і сло-

ваўтварэнне сучаснай бел. мовы, граматыку рус. мовы, рус.-бел. моўныя ўзаемаадносіны, бел. тапаніміку і анамастыку, методыку выкладання бел. і рус. моў у сярэдніх і вышэйшых навуч. установах. Аўтар манаграфій «Прыслоўе ў беларускай мове» (1962), «Дзеяслоў у беларускай мове» (1968), вучэбнага дапаможніка для студэнтаў «Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія» (1987). Сааўтар кніг «Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы» (ч. 1—3, 1957—61), «Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (1959), «Граматыка беларускай мовы» (т. 1—2, 1962—66), «Марфемная дыстрыбуцыя ў беларускай мове: Дзеяслоў» (1967, з В.Мартынавым, М.Ярмаш), «Беларуская граматыка» (ч. 1, 1985), «Беларуская мова: Энцыклапедыя» (1994), падручнікаў для школ. Адзін са складальнікаў «Беларуска-рускага слоўніка» (1962), «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы» (т. 1—5, 1977—84), «Тлумачальнага слоўніка рускай мовы» (2-е выд., 1985, з А.Баханьковым, І.Гайдукевічам), «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы» (5-е выд., 1996) і інш. Дзярж. прэмія Беларусі 1998.

Тв.: Уводзіны ў граматыку беларускай мовы. Мн., 1969; Прыназоўнік у беларускай мове. Мн., 1971; Лекцыі па беларускай марфалогіі. Мн., 1975; Тлумачальны слоўнік беларускіх прыназоўнікаў. Мн., 1993. *І.К.Германовіч.*

Ф.Шуберт.

ШУ́БЕРТ (Schubert) Франц (31.1.1797, Ліхтэнталь, прадмесце Вены — 19.11.1828), аўстрыйскі кампазітар. Вучыўся ў канвікце (школа для прыдворных пеўчых; 1808—13), адначасова харыст Венскай прыдворнай капэлы. З 1818 займаўся кампазітарскай дзейнасцю. Адзін з першых прадстаўнікоў прагрэс. муз. рамантызму, пашырыў лірычную сферу музыкі, узмацніў яе псіхал. выразнасць, нац. акрэсленасць, абапраўся на традыцыі *венскай класічнай школы*. Цэнтр. месца ў яго творчасці займае вак. лірыка. Узбагаціў выразныя магчымасці песні-раманса, паглыбіў суадносіны паміж музыкай і паэт. тэкстам, павялічыў вобразна-сэнсавую ролю фартэпіяннага акампанементу, надаў гэтаму жанру высокае ідэйна-маст. значэнне. Стварыў новыя рамант. тыпы сімфоніі, фартэпіянныя мініяцюры. У інстр. творы ўводзіў песенныя тэмы, ужываў у іх песенныя прынцыпы формаўтварэння. Сярод твораў: оперы зінгшпілі, 7 мес, у т.л. «Нямецкі рэквіем» (1818), 9 сімфоній, у т.л. «Незавершаная» (1822), камерна-інстр. ансамблі, у т.л. фартэпіянны квінтэт «Фарэль» (1819), санаты (больш за 20), экспромты і вальсы для фп., рамант. песні (каля 600, у т.л. вак. цыклы «Прыгожая млынарка», 1823; «Зімовы шлях», 1827) і інш. Паўплываў на развіццё муз. культуры 19 ст.

Літ.: Конен В. Дж. Шуберт. 2 изд. М., 1959; Жизнь Франца Шуберта в документах: Пер. с нем. М., 1963; Вульфиус П. Франц Шуберт. М., 1983. *Г.С.Глушчанка.*

ШУ́БІН Фядот Іванавіч (28.5.1740, в. Цючкоўская Архангельскай вобл., Расія — 24.5.1805), рускі скульптар; адзін з буйнейшых прадстаўнікоў асветніцкага *класіцызму* ў рус. мастацтве. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ у Н.Жыле (1761—67), з 1774 акад. у ёй, з 1794 прафесар. Пенсіянер АМ у Парыжы (1767—70), дзе працаваў пад кіраўніцтвам Ж.Б.*Пігаля*, і Рыме (1770—72). З 1773 у Пецярбургу. Творча пераасэнсаваў лепшыя дасягненні партрэтнай пластыкі франц. ракако, архітэктоніку партрэтнага бюста рус. класіцызму і стварыў уласны варыянт стылю, абумоўлены асветніцкімі ідэямі 18 ст. Раннія творы створаны пад уплывам ант. мастацтва: партрэты І.Шувалава, Ф.Галіцына (абодва 1771). Больш познім творам уласцівы аналіт. падыход да натуры, падкрэсленая шматгранная характарнасць, арганічнасць маст. вобраза: партрэты З.Чарнышова (1774), А.Галіцына (1775), М.Панінай, «Невядомага» (абодва сярэдзіна 1770-х г.), Р.Пацёмкіна-Таўрычаскага (1791), М.Ламаносава (1792), А.Безбародкі (каля 1798). Аўтар 58 медальёнаў з выявамі рус. князёў і цароў (1774—75), статуй і рэльефаў для Мармуровага палаца (1775—82) і Троіцкага сабора Аляксандра-Неўскай лаўры (1786—89), статуі «Кацярына II — заканадаўца» (1789—90) для Таўрычаскага палаца ў Пецярбургу.

Ф.Шубін. Партрэт М.Панінай. Сярэдзіна 1770-х г.

Літ.: Лазарева О.П. Русский скульптор Ф.Шубин. М., 1965. *Л.Ф.Салавей.*

ШУ́БНІКАЎ Аляксей Васілевіч (29.3.1887, Масква — 27.4.1970), расійскі фізік-крышталёграф; стваральнік навук. школы ў галіне крышталяграфіі і крышталяфізікі. Акад. АН СССР (1953, чл.-кар. 1933). Герой Сац. Працы (1967). Скончыў Маскоўскі ун-т (1912). З 1925 у АН СССР (з 1937 заг. лабараторыі крышталяграфіі, з 1944 дырэктар Ін-та крышталяграфіі), адначасова з 1953 праф. Маскоўскага ун-та. Навук. працы па тэорыі сіметрыі, крышталяфізіцы, тэорыі росту крышталёў. Пад яго кіраўніцтвам наладжана вытв-сць сінт. крышталёў і прапанаваны спосабы іх апрацоўкі. Дзярж. прэміі СССР 1947, 1950.

Тв.: Избранные труды по кристаллографии. М., 1975.

Літ.: Проблемы современной кристаллографии: Сб. памяти А.В.Шубникова. М., 1975.

ШУБРА́ЎЦЫ (Towarzystwo Szubrawców, літаральна — «Таварыства нягоднікаў»), легальнае літ.-грамадскае т-ва ліберальнай інтэлігенцыі ў Вільні ў 1816—22. Напачатку існавала ў выглядзе ініцыятыўнай групы асветнікаў, якая рыхтавала выданне «Wiadomści Brukowe» («Вулічныя навіны», пазней друкаваны штотыднёвік т-ва). Заснавальнікі т-ва — М.Балінскі, Л.Бароўскі, Ю.Завадскі, А.Марціноўскі, З.Нямцэўскі, Я.Шымкевіч і інш., прэзідэнты — Шымкевіч, К.Контрым, М.Ромер і А.Снядэцкі. Асн. прынцыпы структурнай арганізацыі і кірункі дзейнасці т-ва адлюстраваны ў т.зв. «Кодэксе шубраўскім», які распрацоўвала спец. камісія ў складзе К.Стравінскага (кіраўнік), Балінскага і Контрыма (прыняты 30.6.1817, апубл. 7.2.1819) і дадатку да яго «Аб рустыканах», а таксама ў артыкулах «Прамова да шубраўства» і «Дадатак да «Вулічных навін» Снядэцкага (студз. 1818). Ш. падзяляліся на сапраўдных членаў, т.зв. «урбанаў» — аўтарытэтных жыхароў Вільні колькасцю не больш як 40 чал. і ўзростам не маладзей за 25 гадоў, ганаровых членаў, т.зв. «рустыкан» (сельскіх жыхароў) 1-й катэгорыі і членаў-карэспандэнтаў («рустыкан» 2-й катэгорыі), колькасць якіх была не абмежавана. Рустыкан 1-й катэгорыі выбіралі з асоб, вядомых публікацыямі ў сферы л-ры і мастацтва; 2-ю катэгорыю Ш. папаўнялі высокаадукаванымі людзьмі, зацікаўленымі ў развіцці навукі, або моладдзю, здатнай да літ. працы. Гал. мэты Ш. — пошукі новых кірункаў сац.-эканам. і духоўнага аздараўлення грамадства, сатырычна-гумарыстычная характарыстыка грамадскіх і асобасных заган. На думку Ш., сродкам маральнага ўдасканалення грамадства

з'яўлялася трапнае друкаванае слова. Асновай сац.-маральнага прагрэсу яны лічылі асвету, узгадаваную на айч. грунце і накіраваную для дабра народу. Т-ва адстойвала роўнасць людзей перад законам, настойліва даводзіла неправамернасць падыходу да асветы як прывілеі толькі заможных слаёў грамадства, даказвала неабходнасць фарміравання кадраў нац. інтэлігенцыі. Па некат. пытаннях сац.-паліт. і літ. жыцця Ш. заставаліся на кансерватыўных пазіцыях. Перанос сатырычнага акцэнту з агульных заган на канкрэтна ўплывовых асоб стаў падставай для закрыцця штотыднёвіка, а пасля і самога т-ва.

Літ.: Chmielowski P. Liberalizm i obskurantyzm na Litwie i Rusi (1815—1823). Warszawa, 1898; Bieliński J. Szubrawcy w Wilnie (1817—1822). Wilno, 1910; Skwarczyński Z. Kazimierz Kontrym. Towarzystwo Szubrawców. Dwa studia. Łódź, 1961. *М.Я.Рыбко.*

ШУВА́ЛАВЫ, расійскі дваранскі род, прадстаўнікі якога займалі значныя дзярж., ваен. і дыпламат. пасады ў 18—19 ст. Найб. вядомы: Пётр Іванавіч (1710—15.1.1762), граф (з 1746), ген.-фельдмаршал (1761). Адзін з арганізатараў дварцовага пераварота (снеж. 1741), у выніку якога на рас. прастол узышла *Лізавета Пятроўна* (1741); пры ёй у 1750-я г. быў фактычным кіраўніком урада; адзін з арганізатараў рус. арміі ў гады *Сямігадовай вайны 1756—63*. Пад яго кіраўніцтвам распрацаваны новыя ўзоры артылерыі, у т.л. «сакрэтная» гаўбіца і гаўбіца *аднарог*, якая была на ўзбраенні рус. арміі больш за 100 гадоў. Яго стрыечны брат Іван Іванавіч (12.11.1727, Масква — 25.11.1797), ген.-ад'ютант (1760), фаварыт Лізаветы Пятроўны (з 1749); апекаваў асвету і навуку, дапамагаў М.В.*Ламаносаву*; 1-ы куратар Маскоўскага ун-та (з 1755), ініцыятар стварэння (1757) і 1-ы прэзідэнт (1757—63) Акадэміі мастацтваў; у 1763—77 выконваў за мяжой дыпламат. і інш. даручэнні ўрада. Аляксандр Іванавіч (1710—71), граф, ген.-фельдмаршал (1761), у 1746—62 нач. *Тайнай канцылярыі*. Пётр Андрэевіч (27.6.1827, Пецярбург — 2.3.1889), граф, ген. ад кавалерыі (1872); нач. штаба (1861), шэф (1866—74) корпуса жандараў, кіраўнік (1861), нач. (1866—74) *Трэцяга аддзялення*; найбліжэйшы саветнік *Аляксандра II*; у 1874—79 пасол Расіі ў Вялікабрытаніі. Яго брат Павел Андрэевіч (25.11.1830, Пецярбург — 20.4.1908), граф, ген. ад інфантэрыі, ген.-ад'ютант, чл. Дзярж. савета (1896); удзельнік Крымскай (1853—56) і рус.-тур. (1877—78) войнаў; пасол Расіі ў Германіі (1885—94), ген.-губернатар *Прывіслінскага краю* (1894—96).

Літ.: Анисимов Е.В. Россия в середине XVIII в. М., 1986. *М.Г.Нікіцін.*

ШУГА́ЕЎ Мікалай Аляксандравіч (1912, г. Сомава Ніжагародскай вобл., Расія — 26.4.1943), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў *Мінскага патрыятычнага падполля*. У пач. 1930-х г. у ліку 25-тысячнікаў накіраваны на Беларусь. Працаваў пам. нач. палітаддзела саўгаса «10-годдзе БССР» Любанскага р-на, інструктарам ЦК КП(б)Б, у апараце Наркамата паліўнай прам-сці БССР. З першых дзён акупацыі ўключыўся ў падп. барацьбу супраць ням.-фаш. захопнікаў, стварыў і ўзначаліў дыверсійную групу ў Варашылаўскім р-не г. Мінска. З мая 1942 сакратар Варашылаўскага падп. райкома КП(б)Б. Пры яго ўдзеле створана партыз. брыгада «Штурмавая». Арыштаваны і закатаваны ў мінскай турме. У Мінску яго імем названа вуліца.

ШУ́ГЛЯ Зоя Міхайлаўна (н. 25.18.1933, в. Балотца Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. вучоны ў галіне глебазнаўства і аграхіміі. Д-р с.-г. н. (1989). Скончыла БСГА (1960). З 1960 у Гродзенскім занальным НДІ сельскай гаспадаркі (у 1981—98 заг. аддзела). Навук. працы па распрацоўцы энергазберагальных сістэм выкарыстання ўгнаенняў. Вывучаны характар і кірунак дзеяння сістэм угнаенняў на асн. аграхім. паказчыкі ўрадлівасці дзярнова-падзолістых супясчаных глеб і ўмовы іх рэгулявання.

Тв.: Влияние длительного применения навоза и минеральных удобрений на свойства почвы и продуктивность севооборота (разам з Л.А. Карагінай) // Агрохимия. 1982. № 5; Изменение агрохимических свойств супесчаной почвы под влиянием длительного применения удобрений в севообороте // Почвенные исследования и применение удобрений. Мн., 1992. Вып. 22; Системы удобрения дерново-подзолистых супесчаных почв. Мн., 1998.

ШУГНА́НСКІ ХРЫБЕ́Т. У Зах. Памеры, у Таджыкістане. Водападзел рэк Гунт і Шахдара. Даўж. каля 80 км, выш. да 5704 м (пік Скалісты). Пераважае высакагорны рэльеф. Ледавікі (агульная пл. каля 150 км^2). На схілах высакагорныя стэпы і лугі.

ШУ́ДРЫ, ніжэйшае з 4 саслоўяў (*варнаў*) стараж. Індыі. Фарміравалася з людзей пакораных плямён і прынятых у абшчыну чужынцаў. Ім было забаронена праходзіць абрад *ініцыяцыі* («другога нараджэння») і яны назаўсёды заставаліся непаўнапраўнымі («аднойчынароджанымі») членамі абшчыны, дзе былі слугамі, рамеснікамі, інш. залежнымі і падначаленымі работнікамі. У 1-я ст. н.э. статус Ш. павысіўся і яны па сваім становішчы наблізіліся да *вайшыяў*.

ШУ́ІН Канстанцін Аляксандравіч (4.11.1913, с. Барысаўскае Яраслаўскай вобл., Расія — 13.6.1991), бел. вучоны ў галіне агародніцтва. Д-р с.-г. н., праф. (1964). Скончыў Маскоўскую с.-г. акадэмію імя Цімірязева (1940). Працаваў у Бурацкім с.-г. ін-це. З 1961 заг. кафедры агародніцтва БСГА. Навук. працы па агратэхніцы і арашэнні агародніных культур, вырошчванні агародніны ў ахаваным грунце.

Тв.: Овощные культуры. Мн., 1974; Производство овощей в Нечерноземье. Л., 1982 (разам з І.Ц.Дударавым, П.С.Міранцовым); 70 видов овощей на огороде. 2 изд. Мн., 1985; Овощеводство. Мн., 1987.

ШУ́ЙСКІ Васіль Іванавіч, расійскі цар [1606—10]. Гл. *Васіль Іванавіч Шуйскі*.

ШУ́ЙСКІЯ, княжацкі і баярскі род у Расіі 15—17 ст.; адгалінаванне роду ніжагародска-суздальскіх князёў *Рурыкавічаў* (ад сына *Аляксандра Неўскага* Андрэя). Розныя лініі роду вядомы як Ш. (старэйшая лінія), Глазатыя-Ш., Барбашыны-Ш., Гарбатыя-Ш., Скапіны-Ш. Адыгрывалі найважнейшую ролю ў паліт. жыцці дзяржавы. Найб. вядомыя прадстаўнікі: кн. Васіль Васілевіч Ш. (?—кастр. 1538), баярын, ваявода ў войнах Маскоўскага вял. княства з ВКЛ пач. 16 ст., фактычны правіцель Расіі пры малалетнім *Іване IV* пасля смерці вял. княгіні Алены Глінскай (13.4.1538); яго брат кн. Іван Васілевіч Ш. (?—1542), фактычны правіцель Расіі ў 1538—40 і 1542; кн. Аляксандр Барысавіч Гарбаты-Ш. (?—1565), баярын, ваявода, фактычны кіраўнік рус. арміі пры ўзяцці Казані ў 1552, чл. *Выбранай рады*; кн. Іван Пятровіч Ш. (?—1588), баярын, ваявода, кіраўнік *Пскова абароны 1581—82*, чл. рэгенцкага савета пры няздольным да кіравання цару *Фёдару Іванавічу* (1584—86), як праціўнік *Барыса Гадунова* сасланы ім і пазней забіты; цар *Васіль Іванавіч Шуйскі* (1552—1612); кн. М.В.*Скапін-Шуйскі* (1526—1610), вядомы рус. палкаводзец. У 16 — пач. 17 ст. ўсе лініі роду Ш. спыніліся. Апошні іх прадстаўнік — кн. Іван Іванавіч Ш. (?—1638).

ШУКА́ЙЛА Паўлюк (Павел Захаравіч; 1904, в. Лапенеўцы Бераставіцкага р-на Гродзенскай вобл. — 14.4.1939), бел. пісьменнік. Праф. (1933). З 1926 вучыўся ў БДУ, скончыў Камуніст. акадэмію ў Маскве (1930). У пач. 1920-х г. удзельнік нац.-вызв. руху ў Зах. Беларусі, чл. КПЗБ. З 1924 у БССР. Быў сакратаром Расонскага райкома КП(б)Б, удзельнічаў у рабоце полацкай філіі «*Маладняка*». У 1925 у Слуцку, рэдактар акр. газеты, арганізатар філіі «Маладняка». З 1926 у Мінску, ініцыятар стварэння «*Беларускай літаратурна-мастацкай камуны*», рэдактар час. «Росквіт». З 1928 у Маскве. У 1930—31 палітрэдактар у Галоўліце СССР, заг. кафедры метадалогіі мастацтва Ін-та кінематаграфіі. Да 1931 кіраўнік бел. секцыі Маскоўскай асацыяцыі пралет. пісьменнікаў. У вер. 1930 арыштаваны, праз месяц вызвалены. З 1932 у Ленінградзе, віцэ-прэзідэнт Дзярж. акадэміі мастацтваў. З 1936 у Маскве. У 1938 рэпрэсіраваны. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1959. Друкаваўся з 1925. Першая і адзіная кніга паэзіі — «Акрываўленая зямля» (1930), у якую ўвайшлі вершы,

паэмы «Акорды дзён» і «Партызанка Люба». У крытычных артыкулах арыентаваўся на ідэйна-эстэт. платформу час. «Новый ЛЕФ», займаў ваяўнічую і непрымірымую бальшавіцкую пазіцыю, зыходзячы з якой крытыкаваў паэзію А.Вольнага, А.Дудара, У.Жылкі, Т.Кляшторнага, В.Маракова, Я.Пушчы, П.Труса і інш. *У.М.Міхнюк.*

ШУКА́ЛЬНІК, 1) у тэлефаніі і тэлеграфіі — камутацыйная прылада для злучэння абаненцкіх ліній у аўтаматычных тэлеф. і тэлегр. станцыях і інш. апаратах аўтаматыкі. Мае 1 уваход і некалькі выхадаў, забяспечвае (разам з блокам кіравання) выбар аднаго з выхадаў і далучэння да яго ўваходу. Гл. таксама *Камутатар*. 2) Ш. пашкоджанняў — прылада для выяўлення месца пашкоджання ліній электрарадачы (напр., кароткага замыкання ці абрыву правадоў). Прынцып дзеяння звычайна грунтуецца на вымярэнні інтэрвала часу паміж пасылкай эл. імпульсу і прыёмам імпульсу, адбітага ад месца пашкоджання. 3) Ш. у астраноміі — дапаможная астр. труба, аптычная вось якой паралельная аптычнай восі асн. тэлескопа. Мае большае поле зроку; служыць для хуткага адшукання на небе патрэбнага аб'екта і навядзення на яго тэлескопа.

ШУКА́НАЎ Адам Сямёнавіч (н. 20.6.1929, в. Чамярное Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. вучоны ў галіне мікалогіі. Канд. біял. н. (1967), праф. (1990). Засл. работнік вышэйшай школы Беларусі (1982). Скончыў БДУ (1962), дзе і працаваў (у 1971—96 заг. кафедры, у 1980—96 дэкан). Навук. працы па праблемах фітапаталогіі с.-г. раслін.

Тв.: Некаторыя асаблівасці прарастання канідый грыба Peronospora schleidenii unger // Весці АН БССР. Сер. біял. навук. 1974. № 4; Да пытання аб дынаміцы развіцця ілжывай мучністай расы буракоў // Там жа. № 5; Изменение содержания пигментов и фотохимической активности хлоропластов в растениях флоксов, пораженных мучнистой росой (разам з М.А.Лемязой, Г.П.Гулевіч) // Микология и фитопатология. 1980. Т. 14, № 2.

ШУКЕ́ВІЧ Вандалін Аляксандравіч (10.12.1852, в. Нача Воранаўскага р-на Гродзенскай вобл. — 1.12.1919), бел. археолаг, антраполаг, краязнавец і этнограф. Чл.-кар. Кракаўскай АН. Адукацыю атрымаў у Вільні. З 1872 жыў у в. Нача. З 1883 даследаваў курганныя і бескурганныя могільнікі каля вёсак Нача, Пузелі (Пузельская гара), Апонаўцы, Гаворскія, Тоўцішкі, Сабакінцы (Першамайская), Клябанія (Папяржыня), Нарбутова, Дварчаны, Вензаўшчына, Сырні, Чарнішкі. Толькі на тэр. Лідскага пав. даследаваў 120 каменных магіл (да 1915 абследаваў 170). Першы з бел. археолагаў раскапаў 16 курганоў і 376 каменных магіл тыпу *жальнікаў* 13—14 ст. Вёў раскопкі каля Віцебска, Лепеля, Радашковіч, воз. Дрысвяты. Апублікаваў працы, прысвечаныя археал. знаходкам і раскопам, гісторыі і прыродзе Беларусі і Літвы: «Музей Федаровіча» (1900), «З мінулага Літвы» (1906), «Успаміны з года 1863» (1907), «Даўнія каралеўскія лясы ў Літве» і «Замак у Лідзе» (1911), «Раскопкі ў Начы (Лідскі пав.)» і «Мерач» (1912), «Возера Дрысвяты» і «Адміністрацыйныя і эканамічныя адносіны ў каралеўшчынах на Літве» (1913), «Трэпанаваныя чарапы з могільніка пад Начай» (1914) і інш. Традыц. нар. культуры беларусаў і інш. народаў (пераважна Віленшчыны) прысвяціў артыкулы: «Народныя вераванні і абрады (забабоны, прымхі, варожбы і г.д.), сабраныя ў Віленскай губерні» (выкарыстаў фальклор. запісы ўраджэнца Трокскага пав. У.Абакановіча) і «Упрыгожаныя крыжы ў Віленскай губерні» (1903), «Нарысы з Белай Русі» і «Звычаі пры выпечцы хлеба ў Лідскім пав.» (1912), «Спосабы фарбавання пісанак у Лідскім пав.» (1913) і інш. Першы з бел. археолагаў (у садружнасці са спецыялістамі-хімікамі) пачаў рабіць аналізы стараж. знаходак. Запісаў шмат легенд і паданняў пра помнікі даўніны. Імкнуўся прасачыць эвалюцыю абраду пахавання ад эпохі латэну да часоў ВКЛ. Першы ўзняў праблемы даследавання Чорнай Русі як гіст. з'явы, надаваў асаблівае значэнне геагр. фактару яе засялення, спрабаваў даць прыкладную храналогію змены культур гэтага рэгіёна. Удзельнік 9-га археал. з'езда ў Вільні (1893). Быў чл. Віленскага т-ва сяброў навукі і Варшаўскага краязнаўчага т-ва. Частку матэрыялаў са сваёй археал. калекцыі перадаў у музеі Кракава, Пецярбурга, Масквы, Вільні.

Г.А.Каханоўскі, А.Ф.Літвіновіч.

ШУКРУЛО́ (сапр. Юсупаў Шукрулло; н. 2.9.1921, Ташкент), узбекскі пісьменнік. Нар. паэт Узбекістана (1981). Скончыў Ташкенцкі пед. ін-т (1944). У 1951 рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны. У 1951—65 рэдактар выд-ва «Узбекістан». Першы зб. «Першы сшытак» (1949). У зб-ках вершаў «Песні сэрца» (1949), «Натхненні жыццём» (1956), «Пакуль жыву» (1960), «Чалавек і дабро» (1962), «Чалавек — для чалавека» (1964), «Апора» (1977) і інш. усхваляў прыгажосць чалавечай душы. Аўтар публіцыстычнага зб. «Помслівы свет» (1994), кн. эсэ «Куфар з каштоўнымі камянямі» (1977), паэм «Світанне 26-га» (1967), «Дастаны» (1970), «Спрэчка стагоддзя» (1985), раманаў «Пахаваныя без савана» (1989), «Жывыя прывіды» (1995), аповесці «Куфар каштоўнасцей» (1983), п'ес «Небяспечная дарога» (1963), «Бязгучны лямант» (1991) і інш., твораў для дзяцей. Перакладае на ўзб. мову творы М.Танка, а таксама І.В.Гётэ, К.Гоцы і інш. На бел. мову яго асобныя творы пераклалі Р.Барадулін, Э.Валасевіч, Х.Жычка, Г.Кляўко, М.Маляўка і інш. Дзярж. прэмія Узбекістана імя А.Наваі 1991.

Тв.: Рус. пер. — Избранное: Стихи. Сундук с драгоценными камнями. М., 1987; Крик души: Пьесы. М., 1991. *Х.Абдуназар.*

ШУКШЫ́Н Васіль Макаравіч (25.7.1929, с. Сросткі Бійскага р-на, Алтайскі край — 2.10.1974), рускі пісьменнік, кінарэжысёр, акцёр. Засл. дз. маст. Расіі (1969). Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1960). Друкаваўся з 1959. У зб-ках апавяданняў «Вясковыя жыхары» (1963), «Там, удалечыні» (1968), «Характары» (1973), гіст.-рэв. рамане «Любавіны» (ч. 1—2, 1965—87; фільм «Канец Любавіных», 1972), п'есе «Энергічныя людзі» (паст. 1974) і сцэнарыях

В.М.Шукшын.



К.Г.Шул.

фільмаў, у якіх выступаў і як рэжысёр («Жыве такі хлопец», 1964; «Печкі-лавачкі», 1972; «Каліна чырвоная», 1974; у двух апошніх выканаўца гал. ролі) праўдзівыя карціны тагачаснага жыцця, разнастайнасць сац.-псіхал. тыпаў, вобразы «дзівакоў», правінцыялаў, якія нясуць у сабе маральную чысціню і патрабавальнасць да жыцця. Творам Ш. ўласцівы драматызм канфліктаў у спалучэнні з гумарам і лірызмам. Раман «Я прыйшоў даць вам волю» (1971) пра Сцяпана Разіна. Як акцёр ва ўласных і інш. кінафільмах ствараў вобразы самабытных людзей, якія шукаюць сваё прызначэнне на зямлі: «Каля возера» (1970, Дзярж. прэмія СССР 1971), «Яны змагаліся за Радзіму» (1975), «Прашу слова» (1976) і інш. Рэжысёрская манера Ш. адметная спалучэннем рэаліст. фактурнасці, побытавай дэталізацыі, псіхал. глыбіні з паэт. успрыманнем прыроды і людзей. Аўтар публіцыстычных артыкулаў (зб. «Пытанні да самога сябе», 1981). На бел. мову асобныя апавяданні Ш. пераклалі Н.Граковіч, Т.Мартыненка. Спектаклі паводле твораў Ш. ставілі т-ры Беларусі: «Характары» — Брэсцкі абл. драм. т-р (1973), Бел. т-р імя Я.Купалы (1975); «Энергічныя людзі» — Дзярж. рус. драм. т-р, Бел. т-р імя Я.Коласа, Брэсцкі абл. (усе 1975); «Да трэціх пеўняў» — Дзярж. т-р лялек (1976); «Ваня, як ты тут?» — т-р імя Я.Купалы (1978); «Каліна чырвоная» — Гродзенскі абл. драм. т-р (1981); «А раніцой яны прачнуліся» — рус. драм. т-р (1983) і інш. Ленінская прэмія 1976.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—3. М., 1984—85.

Літ.: Коробов В. Василий Шукшин. М., 1977; Толченова Н.П. Слово о Шукшине. М., 1982; Емельянов Л. Василий Шукшин: Очерк творчества. Л., 1983.

ШУЛ (Shull) Кліфард Глінвуд (23.9.1915, г. Пітсбург, ЗША — 31.3.2001), амерыканскі фізік, адзін з заснавальнікаў нейтроннай дыфрактаметрыі. Чл. Нац. АН ЗША (1975), Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1956). Скончыў Тэхнал. ін-т Карнегі (1937) і Нью-Йоркскі ун-т (1941). З 1946 у Ок-Рыджскай нац. лабараторыі (штат Тэнесі). У 1955—86 праф. Масачусецкага тэхнал. ін-та. Навук. працы па развіцці метадаў нейтроннага рассеяння, распрацоўцы і выкарыстанні нейтронных дыфрактометраў для вывучэння структуры рэчыва. Разам з інш. развіў метад дыфракцыі нейтронаў (1946), які знайшоў шырокае выкарыстанне пры даследаванні ўласцівасцей нуклонаў і структуры ядра, у фізіцы цвёрдага цела. Эксперыментальна пацвердзіў прапанаваную Л.Э.Ф.*Неелем* тэорыю антыферамагнетызму (1951). Нобелеўская прэмія 1994 (з Б.Н.*Брокхаўсам*, гл. Дадатак).

Тв.: Рус. пер. — Раннее развитие физики нейтронного рассеяния // Успехи физ. наук. 1995. Т. 165, № 12. *М.М.Касцюковіч.*

ШУЛЕ́ЙКІН Міхаіл Васілевіч (2.11.1884, Масква — 17.7.1939), расійскі вучоны ў галіне радыётэхнікі, адзін з заснавальнікаў далёкай эл. сувязі ў СССР. Акад. АН СССР (1939). Скончыў С.-Пецярбургскі політэхн. ін-т (1908), дзе і працаваў. З 1913 на радыётэлегр. з-дзе Марскога ведамства. З 1918 у Чырв. Арміі, брыгадны інжынер (1936). У 1918—21 кіраваў радыётэхн. лабараторыяй ваенна-інж. ўпраўлення. З 1919 праф. Маскоўскага вышэйшага тэхн. вучылішча, з 1921 — Ін-та нар. гаспадаркі. З 1938 кіраўнік камісіі радыёсувязі АН СССР. Навук. працы па тэорыі антэн, прыёмных і перадавальных устройстваў, распаўсюджванні радыёхваль. Тэарэтычна абгрунтаваў магчымасць радыёперадачы ўздоўж зямной паверхні.

Літ.: М.В.Шулейкин. М., 1952.

ШУ́ЛЕР (ад польск. szuler ашуканец), гулец у картачнай гульні, які выкарыстоўвае несумленныя, махлярскія прыёмы. Таксама Ш. наз. (з пагардай і асуджэннем) чалавека-падманшчыка, ашуканца ў любой інш. справе.

ШУЛЁНАК, шулячок (Falco, або Erythropus, vespertinus), птушка сям. сакалініх атр. сокалападобных, або дзённых драпежных птушак. Пашыраны ў Еўразіі. Жыве ў невял. гаях і на асобных дрэвах. На Беларусі рэдкі від, занесены ў Чырв. кнігу.

Даўж. цела 28—34 см, маса 130—200 г. Самкі буйнейшыя за самцоў. Апярэнне шчыльнае, цвёрдае. Афарбоўка самцоў шызабурая, галава чорная, задняя ч. бруха, падхвосце і апярэнне галёнак рыжыя, лапы чырвоныя. Самкі шэрыя з цёмнымі буравата-шэрымі папярочнымі палоскамі на спіне, ніз вохрысты, галава рыжая, уніз ад вока невял. бурыя «вусы», лапы аранжавыя. Дзюба моцная, кручкаватая, блакітнаватая. Нясе 3—4 яйцы. Корміцца насякомымі, зрэдку мышападобнымі грызунамі, птушкамі і інш.

ШУЛЁЎ Генадзь Сяргеевіч (н. 1.7.1933, г. Струніна Уладзімірскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне тэхналогіі машынабудавання. Канд. тэхн. н. (1965), праф. (1992). Скончыў Калінінградскі тэхнал. ін-т рыбнай прам-сці і гаспадаркі (1960). У 1977—97 у Гомельскім політэхн. ін-це (у 1979—95 заг. кафедры). Навук. працы па стварэнні, даследаванні і ўкараненні ў вытв-сць высокаэфектыўных і канкурэнтаздольных магніта-электрычных спосабаў апрацоўкі, умацавання і аднаўлення дэталей машын і механізмаў.

Тв.: Чистовая обработка деталей в магнитном поле ферромагнитными порошками. Мн., 1967 (разам з Я.Р.Канавалавым).

ШУЛЬГА́ Сяргей Мікалаевіч (н. 15.11.1953, г. Бугульма, Татарстан), бел. акцёр, кінарэжысёр. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1975), Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1985). З 1975 у Магілёўскім абл. драм. т-ры, у 1976—77, 1979—80 у Бел. т-ры імя Я.Коласа. З 1985 працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм», з 1997 — у «Белвідэацэнтры». Сярод найб. значных роляў: у Магілёўскім т-ры — Дзімка Малахаў («Апошняя інстанцыя» М.Матукоўскага), Пашка («Летась у Чулімску» А.Вампілава), Марат («За ўсё добрае — смерць» М.Ібрагімбекава); у т-ры імя Я.Коласа — Сымон («Сымон-музыка» паводле аднайм. твора Я.Коласа), Арман Дзюваль («Дама з камеліямі» А.Дзюма-сына), Кей («Снежная каралева» Я.Шварца), Сакрат («Ноч пасля выпуску» У.Цендракова). Паставіў фільмы: маст. — «Цубанікі» (1988, паводле А.Дударава), «Хам» (4 серыі, 1989, з Дз.Зайцавым), «Хроніка мёртвай Савы» (1994; тэлевізійны фільм-спектакль), а таксама шэраг каротказметражных фільмаў; дакумент. — «Пра кінарэжысёра» (1997), «Шляхі Гасподнія...» (1999), «Экспансія» (2000), «Час акцёра. Дывертысмент» (2001), «Яго Вялікасць Тэатр» (2002). Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1978.

ШУЛЬГІ́Н Васіль Віталевіч (13.1.1878, Кіеў — 15.2.1976), расійскі паліт. дзеяч, публіцыст. Скончыў Кіеўскі ун-т (1900). З пач. 1900-х г. адзін з лідэраў рус. манархісцкага руху на Украіне, супрацоўнік яго газ. «Киевлянин». Дэп. 2—4-й Дзярж. дум (1907—17), дзе быў адным з кіраўнікоў фракцыі *нацыяналістаў*. Удзел Ш. (артыкулы, выступленні) у грамадскай кампаніі 1912—13 у абарону кіеўскага яўрэя М.М.Бейліса, які быў абвінавачаны ў рытуальным забойстве хлопчыка-хрысціяніна (Бейліс апраўданы судом прысяжных), прывёў яго да разрыву з манархістамі і каштаваў яму 3-месячнага арышту. У час Лют. рэвалюцыі 1917 чл. *Часовага камітэта Дзяржаўнай думы*; 15.3.1917 разам з А.І.*Гучковым* выставіў імператару *Мікалаю II* патрабаванне Думы аб адрачэнні ад прастола. Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 удзельнік белага руху, адзін з арганізатараў Добраахвотніцкай арміі ген. А.І.*Дзянікіна*. З 1920 у эміграцыі. У 1925—26 нелегальна наведаў СССР. З 1930-х г. жыў у Югаславіі, у 1937 адышоў ад паліт. дзейнасці. У 1944 арыштаваны сав. органамі бяспекі, вывезены ў СССР і асуджаны на 25 гадоў зняволення. У 1956 вызвалены, жыў у г. Уладзімір. У пач. 1960-х г. звярнуўся з 2 адкрытымі лістамі да рус. эмігрыцыі з заклікам адмовіцца ад варожых адносін да СССР. Аўтар кніг «Дні» (1925), «1920-ы год», «Тры сталіцы» (абедзве 1927).

Тв.: Письма к русским эмигрантам. М., 1961. *М.Г.Нікіцін.*

Шулёнак: 1 — самка; 2 — самец.

ШУЛЬГО́ЎСКІ Фёдар Несцеравіч (22.4.1893, г.п. Коханава Талачынскага р-на Віцебскай вобл. — 21.4.1968), генерал-лейтэнант інж.-тэхн. службы (1943). Дацэнт (1940). Скончыў курсы ўдасканалення пры Ваен. паветр. акадэміі (1928), Маскоўскі авіяц. ін-т (1934). У арміі з 1914, у Чырв. Арміі са жн. 1918. Удзельнік грамадз. вайны 1918—20. З 1938 у Ваен. паветр. акадэміі (выкладчык, нач. кафедры, ф-та), з 1942 нач. Упраўлення ў Цэнтр. апараце ВПС, у 1946—47 нач. Ленінградскай ваенна-паветр. акадэміі.

ШУЛЬЖЭ́НКА Клаўдзія Іванаўна (24.3.1906, г. Харкаў, Украіна — 17.6.1984), расійская эстрадная спявачка. Нар. арт. СССР (1971). З 1923 актрыса Харкаўскага драм. т-ра, з 1929 на эстрадзе; салістка Лендзяржэстрады, з 1943 Усерас. гастрольна-канцэртнага аб'яднання. Яе выкананню былі ўласцівы глыбокая задушэўнасць, выдатная дыкцыя, выразныя міміка і пластыка. Сярод вядомых песень яе рэпертуару «Сіняя хустачка» Я.Пецярбургскага, «Давай закурым» М.Табачнікава і інш. Паўплывала на станаўленне жанру сав. эстр. песні.

ШУ́ЛЬМАН Зіновій Пінхусавіч (н. 23.2.1924, ст. Пціч Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл.), бел. фізік. Д-р тэхн. н. (1970), праф. (1971). Засл. дз. нав.

Беларусі (1989). Скончыў Ленінградскі політэхн. ін-т (1953). З 1957 у Ін-це цепла- і масаабмену Нац. АН Беларусі (у 1971—89 заг. лабараторыі). Навук. працы па рэафізіцы, гідрамеханіцы, цеплафізіцы, цеплатэхніцы, біямед. рэалогіі. Сфармуляваў закон нелінейнавязкапластычнага цячэння (1967). Даў тэарэт. тлумачэнне з'яве зацягвання гідрадынамічнага адрыву пры абцяканні затупленых цел палімерными растворамі, распрацаваў тэарэт. асновы электра- і магн. рэалогіі.

Тв.: Конвективный тепломассоперенос реологически сложных жидкостей. М., 1975; Магнитореологический эффект. Мн., 1982 (разам з В.І.Кардонскім); Нестационарные процессы конвективного переноса в наследственных средах. Мн., 1983 (разам з Б.М.Хусідам). *М.П.Савік.*

ШУ́ЛЬМАН Іосіф Абрамавіч (25.4.1912, в. Княжыцы Магілёўскага р-на — 1980-я г.?), бел. кінарэжысёр. Засл. дз. маст. Беларусі (1969). Скончыў Магілёўскі пед. тэхнікум (1930), Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1936). Працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм». Сярод фільмаў: дакумент. — «Слуга народа» (1950), «У заводскім раёне» (1951), «Парашуты на дрэвах» (1973) і інш.; маст. — «Шчасце трэба берагчы» (1958), «Чалавек не здаецца» (1960), «Крыніцы» (1965), «І ніхто іншы» (1967), «Нечаканае каханне» (1971), «Усяго адна ноч» (1976), «Сустрэча ў канцы зімы» (1978) і інш. З 1980-х г. у Аўстраліі.

ШУ́ЛЬМАН Рыгор Абрамавіч (н. 3.1.1934, г.п. Азарычы Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1992), праф. (1993). Скончыў Гродзенскі пед. ін-т (1955). З 1971 у Брэсцкім ун-це (у 1971—75 заг. кафедры). Навук. працы па ўласцівасцях і ператварэннях рэчываў пры высокіх шчыльнасцях, тэмпературах і магутных магн. палях.

Тв.: К оценке критических параметров вырожденных магнитных белых карликов // Астр. журн. 1977. Т. 54, вып. 5; Нейтронный газ вырожденной сверхплотной звезды с вмороженным магнитным полем // Там жа. 1991. Т. 68, вып. 1; Наглядное представление квантования движения релятивистского электрона в магнитном поле // Изв. вузов. Физика. 2003. №1.

ШУЛЬЦ Міхал (1769—1812), літоўскі і бел. архітэктар. У 1788 скончыў Гал. школу ВКЛ (з 1803 Віленскі ун-т), з 1797 выкладаў у ёй (з 1799 праф., узначальваў кафедру архітэктуры). На Беларусі паводле яго праекта пабудаваны палац Агінскіх у в. Залессе Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл. (гл. *Залескі палацава-паркавы ансамбль*). Распрацаваў 2 праекты гімназічнага комплексу ў г. Свіслач Гродзенскай вобл. (1802, 1810, не рэалізаваны). У пач. 19 ст. кіраваў рэстаўрацыйнымі работамі па аднаўленні ў Вільні Кафедральнага сабора, касцёла св. Ганны і інш.

В.Ф.Марозаў.

ШУЛЬЦ (Schultz) Тэадор Уільям (30.4.1902, г. Арлінгтан, ЗША — 26.2.1998), амерыканскі эканаміст; прадстаўнік *Чыкагскай школы* ў палітэканоміі. Чл. Нац. АН ЗША, чл.-заснавальнік Нац. акадэміі адукацыі. Д-р н. па эканоміцы сельскай гаспадаркі. Вучыўся ў Калумбійскім і Вісконсінскім ун-тах. З 1943 праф. Чыкагскага ун-та (у 1952—73 заг. кафедры), дырэктар Нац. бюро эканам. даследаванняў (1949—67), прэзідэнт Амер. эканам. асацыяцыі (з 1960). Навук. працы па праблемах эканомікі, выкарыстання прац. рэсурсаў у сельскай гаспадарцы ЗША і краін, якія сталі на шлях развіцця. Адзін з аўтараў тэорыі «чалавечага капіталу», паводле якой дынамічнасць і эфектыўнасць эканомікі залежаць ад інвестыцый у чалавека — на яго адукацыю і прафес. рост, у сферу аховы здароўя і навукі («Укладанні ў чалавечы капітал», 1971). На яго думку, адукацыя павышае прадукцыйнасць працы індывідуума і эканам. каштоўнасць яго часу («Эканамічная каштоўнасць адукацыі», 1963). Асабліва цікавіўся праблемамі адукацыі жанчын і моладзі, развіцця бедных агр. народаў («Меры для эканамічнага развіцця неразвітых краін», 1951). Аўтар прац «Пераўтвараючы традыцыйную сельскую гаспадарку» (1964), «Чалавечыя рэсурсы, чалавечы капітал» (1972), «Інвестыцыі ў людзей: Эканоміка якасці насельніцтва» (1981) і інш. Нобелеўская прэмія 1979 (з У.А.*Льюісам*). *С.Ф.Дубянецкі.*

ШУЛЬЦ (Schulz) Фрыдрых (1762, г. Магдэбург, Германія — 1798), нямецкі пісьменнік, падарожнік. Скончыў ун-т у Гале (?), дзе выкладаў мовы. Пазней працаваў у Дрэздэне, Вене, Берліне, Веймары, Парыжы. З 1790 праф. акадэміі ў г. Мітава (Курляндыя). У 1791 абраны паслом ад мяшчанскага саслоўя на Чатырохгадовы сойм 1788—92 Рэчы Паспалітай. Паездку на сойм апісаў у кн. «Падарожжа ліфляндца з Рыгі да Варшавы» (1797), дзе даў звесткі пра тагачаснае паліт. жыццё і норавы Рэчы Паспалітай, апісаў жыллё і вопратку бел. сялян, забудову г. Гродна і інш. У 1793—94 падарожнічаў па Італіі. Аўтар раманаў, апавяданняў, дарожных нататак, гісторыі Франц. рэвалюцыі.

Літ.: Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь. Мн., 1980.

ШУ́ЛЬЦЭ-БО́ЙЗЕНА—ХА́РНАКА АРГАНІЗА́ЦЫЯ, падпольная антыфаш. арг-цыя ў Германіі ў 1938—42. Створана ў 1938—39 у выніку аб'яднання падп. груп пад кіраўніцтвам беспарт. антыфашыстаў обер-лейт. Х.Шульцэ-Бойзена (служыў у мін-ве авіяцыі) і ўрадавага саветніка эканаміста А.Харнака. Уваходзілі камуністы, сацыял-дэмакраты, беспартыйныя (усяго больш за 200 чал.). Дзейнічала ў Берліне, дзе мела сувязі з антыфашыстамі на ваен. прадпрыемствах і ў кіруючых органах вермахта, падтрымлівала кантакты з падп. групамі ў Эсэне, Лейпцыгу, Гамбургу і інш. гарадах. Падпольшчыкі здзяйснялі сабатаж на ваен. прадпрыемствах, вялі антыфаш. прапаганду, дапамагалі збеглым вязням канцлагераў. У 1941 яны звязаліся з сав. разведкай і да восені 1942 перадавалі па радыё ў Маскву каштоўныя звесткі, у т.л. аб планах гітлераўскага камандавання. Апіраючыся на гэтую і інш. антыфаш. арг-цыі, сав. разведка стварыла ў Германіі і акупіраваных ёй краінах Еўропы сетку сваіх рэзідэнтур, якая пазней атрымала назву *«Чырвоная капэла»*. У жн.—вер. 1942 Ш.-Б.—Х.а. разгромлена гестапа: 49 чал., у т.л. кіраўнікі, пакараны смерцю, некалькі скончылі самагубствам. Пасля вайны многія падпольшчыкі пасмяротна ўзнагароджаны ордэнамі СССР.

Літ.: История второй мировой войны, 1939—1945. М., 1975. Т. 4. С. 226; Пещерский В.Л. «Красная капелла»: Советская разведка против абвера и гестапо. М., 2000.

М.П.Нікіцін.

Т.Шульц.

Р.Шуман.

ШУЛЯЧО́К птушка сям. сакаліных; тл. *Шулёнак.*

ШУМ, неўпарадкаваныя ваганні рознай фіз. прыроды, якія адрозніваюцца складанасцю часавай і спектральнай структуры. Асн. віды Ш. — акустычныя і электрычныя (гл. *Флуктуацыі электрычныя*). Характарыстыкі Ш. вымяраюць *шумамерамі*, частотнымі аналізатарамі, карэлометрамі і інш.

Ш. акустычны — розныя непажаданыя перашкоды ўспрыманню мовы, музыкі і інш. Выклікаецца любымі ваганнямі ў цвёрдых, вадкіх і газападобных асяроддзях, асн. крыніцы — розныя рухавікі і механізмы, прыродныя з'явы. Працягліы ці празмерны па інтэнсіўнасці Ш. адмоўна ўплывае на арганізм чалавека (гл. *Шумавое забруджванне*); вядомы таксама заспакойвальны ўплыў яго на чалавека (напр., Ш. лесу ці марскога прыбою). Ш. адыгрывае істотную ролю ў многіх галінах навукі і тэхнікі: оптыцы, радыётэхніцы, радыёлакацыі, радыёастраноміі, выліч. і вымяральнай тэхніцы, медыцыне і інш. (напр., змяншае дакладнасць вымярэнняў аналагавымі і лічбавымі вымяральнымі прыладамі, абмяжоўвае адчувальнасць прыёмнай апаратуры). Часам выкарыстоўваецца як крыніца інфармацыі, напр., у ваеннай справе, радыёастраноміі. Шумападобныя сігналы выкарыстоўваюць у радыё- і акустычнай тэхніцы для розных вымярэнняў (гл. *Белы шум*).

ШУ́МАВА (Šumava), 2 паралельныя горныя хрыбты на мяжы Чэхіі з Германіяй і Аўстрыяй. Акаймоўваюць на ПдЗ *Чэшскі масіў*. Даўж. каля 140 км. Выш. да 1456 м (г. Гросер-Арбер). Складзены

з гранітаў, гнейсаў, крышт. сланцаў, вяршыні згладжаныя. Хвойныя і мяшаныя лясы, лугі. Ахоўная ландшафтная вобласць Шумава (уключае 10 рэзерватаў у Чэхіі і нац. парк «Баварскі лес» у Германіі).

ШУМАВА́Я ТЭМПЕРАТУ́РА, мера спектральнай шчыльнасці магутнасці эл.-магн. выпрамянення крыніц *шумаў*. Уводзіцца па аналогіі з раўнаважным выпрамяненнем (цеплавым шумам) узгодненага рэзістара, спектральная шчыльнасць магутнасці якога вызначаецца формулай Найквіста: $S = kT$, дзе k — пастаянная Больцмана, T — абс. т-ра рэзістара. Ш.т. рэальных аб'ектаў вызначаецца звычайна ў параўнанні з эталоннымі шумавымі генератарамі. Паняццем Ш.т. карыстаюцца ў радыётэхніцы для ацэнкі шумавых уласцівасцей электравакуумных і паўправадніковых прылад, у радыёастраноміі для апісання крыніц касм. радыёвыпрамянення і інш.

ШУМАВО́Е ЗАБРУ́ДЖВАННЕ, празмернае павышэнне ўзроўню акустычнага *шуму*; адна з форм *фізічнага забруджвання* навакольнага асяроддзя. Асн. крыніцы Ш.з.: транспарт, вытв. і быт. машыны, механізмы і інш.

Прыродны шумавы фон (шум лісця, дажджу) звычайна не перавышае 15—20 дБ і з'яўляецца аптымальным для псіхафіз. стану чалавека і цеплакроўных жывёл. Шумавы фон у сучасным горадзе дасягнуў узроўню прамысл. шумаў. У выніку Ш.з. прыгнечваецца ўмоўна-рэфлекторная дзейнасць і рост жывёл. Яны трацяць здольнасць да размнажэння, зніжаюцца надоі, яйцаноскасць і інш. Пастаянны шум — адзін з фактараў хвароб і заўчаснай гібелі раслін у горадзе.

З мэтай зніжэння Ш.з. ствараюцца сан.-ахоўныя зоны вакол прамысл. прадпрыемстваў, трансп. магістралі і аэрапорты выносяцца па-за межы нас. пунктаў, уздоўж магістралей устанаўліваюць шумапаглынальныя экраны, ствараюць жывыя агароджы і інш.

ШУМАКО́ЎСКАЯ СПА́СА-ПРААБРАЖЭ́НСКАЯ ЦАРКВА́, помнік архітэктуры готыкі і рэнесансу ў в. Шумакі Брэсцкага р-на. Пабудавана ў 1609 князямі Шуйскімі. Невялікі 1-нефавы мураваны храм вырашаны ў простых масіўных формах. Да прамавугольнага ў плане асн. нефа прылягаюць бабінец і паўкруглая алтарная апсіда. Неф і апсіда накрыты агульным 2-схільным дахам з галоўкай на 8-гранным барабане ў цэнтры. Над бабінцам была квадратная ў плане вежа з высокім шатровым дахам (не захавалася). Сцены аздоблены шырокімі пілястрамі, завершаны прафіляваным карнізам. Аконныя праёмы са стральчатымі і лучковымі завяршэннямі. У інтэр'еры разныя царскія вароты ў стылі барока, іканастас 18 ст., надмагільная пліта 17 ст. *А.Я.Міцянін.*

Шумакоўская Спаса-Праабражэнская царква.

ШУМАМЕ́Р, прылада для аб'ектыўных вымярэнняў узроўню *гуку* (акустычнага *шуму*). Мае ненакіраваны вымяральны мікрафон, узмацняльнік, фільтры карэкцыі, дэтэктар і індыкатар. Схема Ш. выбіраецца так, каб яго характарыстыкі набліжаліся да характарыстык вуха чалавека.

ШУ́МАН (Schumann) Роберт (8.6.1810, г. Цвікаў, Германія — 29.7.1856), нямецкі кампазітар і музычны крытык. У 1834—44 рэдактар і гал. аўтар заснаванага ім час. «Neue Zeitschrift für Musik» («Новы музычны часопіс»). У 1843 праф. кансерваторыі ў Лейпцыгу, з 1846 кіраўнік хароў у Дрэздэне, у 1850—53 гар. музік-дырэктар у Дзюсельдорфе. Адзін з найб. яркіх прадстаўнікоў муз. рамантызму. Развіваў рэаліст., дэмакр. тэндэнцыі рамант. мастацтва, узбагаціў музыку новымі формамі, прыёмамі меладычнага і гарманічнага пісьма, стварыў своеасаблівы фартэпіянны стыль. Творчасць Ш. адметная парывістасцю, палкасцю, псіхал. паглыбленасцю, яркай характарыстычнасцю. Яго песням часткова аб'яднаным у цыклы на аснове сюжэтнага, псіхал. або маст.-паэт. адзінства, уласцівы праўдзівасць, глыбіня лірычнага выказвання, тонкая перадача своеасаблівасцей паэт. тэксту. Аўтар праграмных фартэпіянных цыклаў «Матылькі» (1831), «Карнавал» (1835), «Танцы давідсбюндлераў» (1837) і інш.; лірыка-драм. цыклаў «Каханне паэта», «Кола песень», «Каханне і жыццё жанчыны» (усе 1840). Паўплываў на развіццё рамант. фартэпіяннай санаты і варыяцый («Сімфанічныя эцюды»; 2-я рэд. 1852). Творы для фп. вылучаюцца ідэйна-эмацыянальнай насычанасцю і маштабнасцю. Сярод інш. твораў: опера «Генавева» (1838), 4 сімфоніі (1841—51), канцэрты для фп. (1845), віяланчэлі (1850), скрыпкі (1853) з аркестрам, камерныя і хар. творы, музыка да драм. паэмы «Манфрэд» Дж. Байрана (1849) і інш. Займаўся гастрольнай дзейнасцю, у т.л. з жонкай, піяністкай К.Шуман. Аўтар муз.-крытычных і літ. артыкулаў.

Літ. тв.: Рус. пер. — Избр. статьи о музыке. М., 1956; Жизненные правила для музыкантов. М., 1959; Письма. Т. 1—2. М., 1970—82.

Літ.: Житомирский Д.В. Роберт Шуман. М., 1964; Яго ж. Роберт и Клара Шуман в России. М., 1962; Амброс А.В. Роберт Шуман: Жизнь и творчество: Пер. с нем. М., 1988. *Г.С.Глушчанка.*

ШУМА́НСКІ Міхаіл Рыгоравіч (20.10.1920, в. Пераброддзе Міёрскага р-на Віцебскай вобл. — 4.11.1982), бел. спявак (тэнар). Засл. арт. Беларусі (1955). З 1940 саліст Дзярж. акад. хар. капэлы Беларусі. Валодаў прыемным голасам мяккага гучання. Яго творчай манеры ўласцівы выразнасць, шчырасць і цеплыня выканання. З В.*Юневічам* выступаў у дуэце, які вылучаўся высокай творчай культурай. У рэпертуары дуэта бел. нар. песні, творы бел. кампазітараў.

ШУМАПЕЛЕНГА́ТАР, прылада для выяўлення крыніцы *гуку* (*шуму*) і вызначэння напрамку на яго (гл. *Пеленгацыя*). Мае прыёмную акустычную сістэму, узмацняльнік і індыкатарную сістэму. Група Ш., размешчаных у розных пунктах, дазваляе вызначыць месцазнаходжанне крыніцы гуку адначасовым пеленгаваннем. Ш. выкарыстоўваюцца ў асн. у *гідралакацыі*; бываюць карабельныя, верталётныя і стацыянарныя, працуюць у дыяпазонах гукавых, інфра- і ультрагукавых частот.

ШУМЕ́ЙКА Мікалай Максімавіч (н. 22.9.1942, г. Дуброўна Віцебскай вобл.), бел. фізік-тэарэтык. Д-р фіз.-матэм. н. (1984), праф. (1987). Скончыў Маскоўскі ун-т (1966). З 1970 у БДУ (з 1986 нам. дырэктара НДІ ядз. праблем, з 1993 дырэктар Нац. навукова-вучэбнага цэнтра фізікі часціц і высокіх энергій). Навук. працы па ядз. фізіцы і фізіцы высокіх энергій. Распрацаваў універсальны каварыянтны метад разліку радыяцыйных эфектаў у каліброўчнай квантавай тэорыі поля (метад Бардзіна—Ш.), алгарытмы і праграмы ўліку радыяцыйных эфектаў.

Тв.: On an exact calculation of the lowest-order electromagnetic correction to the point particle elastic scattering (разам з Дз.Ю.Бардзіным) // Nuclear Physics. 1977. Vol. B127, №2; О приближенном вычислении электромагнитных поправок к глубоконеупругому LN-рассеянию // Ядерная физика. 1979. Т. 29, вып. 6; Radiative effects in deep inelastic scattering of polarized leptons by polarized light nuclei (разам з І.В.Акушэвічам) // J.Physics. G. Nucl. part. phys. 1994. Vol. 20.

ШУ́МЕН, горад на ПнУ Балгарыі. У 1950—65 наз. Каларaўград. 112 тыс. ж. (1991). Прам-сць: трансп. машынабудаванне (вытв-сць грузавых аўтамабіляў), каляровая металургія (алюм. пракат), харчасмакавая, швейная. Помнік 1300-годдзя балг. дзяржавы. Паблізу Ш. руіны стараж. балг. сталіц *Пліскі* і Прэслава.

ШУМЕ́Р, Шумер, старажытная краіна ў 4—2-м тыс. да н.э. ў Паўд. Месапатаміі, у ніжнім цячэнні рэк Тыгр і Еўфрат, на Пд сучаснага Ірака. Найб. стараж. паселішчы на тэр. Ш. адносяцца да 5—4-га тыс. да н.э. У 2-й пал. 4-га тыс. да н.э. заселена *шумерамі*, якія засн. тут гарады-дзяржавы: *Ур, Урук, Лагаш, Ума, Кіш*, Эрыду і інш. Экано-

міка Ш. была засн. на ірыгацыйным земляробстве: у абшчынных, храмавых і буйнаўласніцкіх гаспадарках выкарыстоўвалася праца вольных абшчыннікаў, кліентаў, рабоў. Змест паліт. жыцця Ш. складала ўнутр. барацьба ў гарадах паміж абшчынай, родава-храмавай арыстакратыяй і вярх. правіцелем. Паміж гарадамі-дзяржавамі вялася барацьба за с.-г. ўгоддзі і ірыгацыйныя сістэмы, што прыводзіла да часовых узвышэнняў аднаго з іх. На пачатку раннедынастычнага перыяду ў 28—25 ст. да н.э. паліт. перавага ад I дынастыі Кіша перайшла да I дынастыі Урука, а потым да I дынастыі Ура. З сярэдзіны 25 ст. да н.э. ўсталявана гегемонія правіцеляў Лагаша (страчана ў 1-й пал. 24 ст. да н.э. пасля няўдалай спробы сац. рэформ Уруінімгіны). Раннедынастычны перыяд скончыўся ў 2-й пал. 24 ст. да н.э. заваяваннем Ш. дзяржавай *Акад*. Акад быў разгромлены гуціямі, якія ў канцы 22 ст. да н.э. выгнаны царом Урука Утухенгалем. Улада над Ш. перайшла да цароў III дынастыі Ура. У канцы 21 ст. да н.э. ў выніку нашэсця *амарытаў* і эламітаў Ш. канчаткова страціў самастойнасць. Пазней існаваў як частка *Вавілоніі*. Пра культуру Ш. гл. ў арт. *Вавілона-асірыйская культура*.

Літ.: Тюменев А.И. Государственное хозяйство древнего Шумера. М.; Л., 1956; Дьяконов И.М. Общественный и государственный строй древнего Двуречья: Шумер. М., 1959; Вулли Л. Ур халдеев: Пер. с англ. М., 1961; Белицкий М. Забытый мир шумеров: Пер. с пол. М., 1980; Крамер С. История начинается в Шумере: Пер. с англ. 2 изд. М., 1991; Ягож. Шумеры: Первая цивилизация на земле: Пер. с англ. М., 2002. *Я.У.Новікаў.*

ШУМЕ́РЫ, старажытны народ, які насяляў Паўд. Месапатамію ў 4—2-м тыс. да н.э. (гл. *Шумер*). Мелі самастойную мову, роднаснасць якой з мовамі інш. груп не ўстаноўлена. У антрапал. адносінах належалі да міжземнаморскай і балкана-каўказскай рас. вял. еўрапеоіднай расы. З сярэдзіны 3-га тыс. да н.э. пачаўся паступовы працэс выцяснення шумерскай мовы і асіміляцыі Ш. акадцамі, які завяршыўся ў 1-й пал. 2-га тыс. да н.э. Ш. — стваральнікі *клінапісу*; шумерская культура паслужыла асновай для развіцця культур пазнейшых цывілізацый Месапатаміі. *Я.У.Новікаў.*

ШУ́МІК Сяргей Васілевіч (5.7.1928, г. Харкаў; Украіна — 1.3.1994), бел. вучоны ў галіне эксплуатацыі аўтамаб. транспарту. Д-р тэхн. н. (1981), праф. (1982). Скончыў Усесаюзны завочны політэхн. ін-т (Масква, 1954). З 1970 нач. кафедры Усурыйскага вышэйшага ваен. аўтамаб. вучылішча. З 1975 у БПА (у 1975—90 заг. кафедры). Навук. працы па праблемах эксплуатацыі і метадах дыягностыкі тэхн. стану аўтамабіляў. Аўтар навуч. дапаможнікаў для ВНУ.

Тв.: Диагностирование и устранение неисправностей легковых автомобилей. Мн., 1987 (разам з Я.Л.Савічам, М.В.Вепрэнцавым); Техническая эксплуатация автотранспортных средств: Курсовое и дипломное проектирование. Мн., 1988 (разам з М.М.Болбасам, Я.І.Петуховым); Техническая эксплуатация автомобилей. Мн., 1996 (разам з Я.Л.Савічам). *У.У.Яцкевіч.*

ШУМІ́ЛАВА Эмілія Іванаўна (н. 7.1.1929, г. Яраслаўль, Расія), расійскі і бел. мастацтвазнавец, крытык, педагог. Канд. мастацтвазнаўства (1967). Скончыла Маскоўскае харэаграфічнае вучылішча (1947), Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва (1954). З 1947 салістка Новасібірскага т-ра оперы і балета, адначасова з 1957 дырэктар і маст. кіраўнік створанага ёю Новасібірскага харэаграфічнага вучылішча. У 1963—64 у Новасібірскім абл. управленні культуры, з 1967 у Мін-ве культуры Расіі, Мін-ве культуры СССР. З 1975 у Мінскім ін-це культуры (з 1983 заг. кафедры), з 1993 у Рас. акадэміі слав. культуры ў Маскве (з 2000 праф.). Даследуе праблемы балетнага т-ра, нацыянальнага ў маст. культуры, харэаграфічнай фальклярыстыкі, муз.-харэаграфічнага выхавання дзяцей і моладзі. Аўтар манаграфій «Праўда балета» і «Нацыянальная своеасаблівасць балета» (абедзве 1976), буклетаў, прысвечаных спектаклям бел. балетнага т-ра, сцэнарыяў дакумент. фільмаў на студыі «Беларусьфільм» «Турбуюся і люблю» (1981), «Творчы партрэт Юрыя Траяна» (1982), «Танцуе Саркісьян» (1983), праграм Бел. тэлебачання «Бальны танец учора і сёння» (1983), «Магія натхнення» (1986) і інш. *М.А.Козенка.*

ШУМІ́ЛІНА, гарадскі пасёлак, цэнтр Шумілінскага р-на Віцебскай вобл. Чыг. станцыя на лініі Віцебск—Полацк; аўтадарогі на Віцебск, Полацк, Бешанковічы, Гарадок. За 40 км ад г. Віцебск. 7,9 тыс. ж. (2002). Прадпрыемствы харч., тарфяной, мясц. прам-сці. 2 сярэднія і юнацка-спарт. школы, Палац культуры, 3 б-кі, бальніца, аптэка, паліклініка, 2 аддз. сувязі. *Шумілінскі гісторыка-краязнаўчы музей*. Брацкая магіла бел. партызан і ахвяр фашызму. Вайсковыя могілкі.

У 19 ст. вёска ў Ловажскай вол. Полацкага пав. Віцебскай губ. У 1866 у Ш. 38 ж., 5 гаспадарак, 13 пабудоў. Пасля будаўніцтва Рыга-Арлоўскай чыг. (1886) пабудаваны чыг. станцыя (да 1962 наз. Сіроціна), царква; вёска выросла ў мястэчка. З 1924 цэнтр *Шумілінскага раёна* (да 1961 Сіроцінскага р-на) Віцебскай акр. (1924—30), з 1938 — Віцебскай вобл.; з 1938 гар. пасёлак. У Вял. Айч. вайну з 8.7.1941 да 23.6.1944 акупіравана ням. фашыстамі, якія знішчылі ў Ш. і раёне 1,5 тыс. чал. У 1962—66 Ш. ў складзе Віцебскага р-на.

Літ.: Память: Ист.-док. хроника Шумилинского р-на. Мн., 1985.

ШУМІ́ЛІНА Ірына Міхайлаўна (н. 3.12.1956, Мінск), бел. піяністка. Засл. арт. Беларусі (1992). Скончыла Бел. кансерваторыю (1980, кл. Р.*Шаршэўскага*). З 1982 салістка Бел. філармоніі. Яе выкананне вылучаецца віртуознасцю, удумлівасцю ў інтэрпрэтацыі муз. першакрыніцы. У рэпертуары пераважаюць творы класікі і сучасных кампазітараў. Першая выканаўца шматлікіх твораў бел. кампазітараў, у т.л. санаты і цыкла фп. п'ес Л.Абеліёвіча (прысвечаны ёй). Лаўрэат Рэсп. і Міжрэсп. (Талін, абодва 1976) конкурсаў музыкантаў-выканаўцаў. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1984. *В.П.Пракапцова.*

ШУМІ́ЛІНСКІ ГІСТО́РЫКА-КРАЯЗНА́ЎЧЫ МУЗЕ́Й. Засн. 28.5.1984, адкрыты 22.11.1986 у г.п. *Шумілінa* як музей нар. славы, з 1993 сучасная назва. Пл. экспазіцыі 163 м^2, 3 залы, больш за 8,5 тыс. экспанатаў асн. фонду (2003). Сярод экспанатаў матэрыялы археал. раскопак на тэр. раёна, пра падзеі грамадз. вайны і ваен. інтэрвенцыі 1918—20, станаўленне сав. улады, абарончыя баі, дзейнасць патрыят. падполля і партыз. руху ў Вял. Айч. вайну, зброя партызан, асабістыя рэчы і дакументы землякоў Герояў Сав. Саюза П.А.*Акуцыёнка*, М.А.*Ласкунова*, Дз.М.*Мінчугова*, М.К.*Спірыдзенкі*, фотаздымкі 106 Герояў Сав. Саюза, якія вызначыліся пры вызваленні Шумілінскага р-на ад фаш. акупантаў. У экспазіцыі прылады працы і побыту, адзенне і абутак сялян і гараджан 19 — пач. 20 ст., вырабы дэкар.-прыкладнога мастацтва, калекцыя жывапісу мясц. майстроў, у т.л. мастака У.П.Белавусава. *С.В.Іванова*

ШУМІ́ЛІНСКІ РАЁН. Размешчаны ў цэнтр. частцы Віцебскай вобл. Утвораны 17.7.1924 як Сіроцінскі р-н, перайменаваны ў Ш.р. 23.11.1961 (скаса-

ваны 25.12.1962, адноўлены 30.7.1966), у сучасных межах з 2.8.1966. Пл. 1,7 тыс. км^2, Нас. 24, 5 тыс. чал. (2003), гарадскога 44,5%. Сярэдняя шчыльн. 14 чал. на 1 км^2. Цэнтр — г.п. *Шуміліна*. Раён уключае г.п. *Обаль*, 262 сельскія нас. пункты, 9 сельсаветаў: Дабейскі, Каўлякоўскі, Лаўжанскі, Мікалаеўскі, Мішневіцкі, Обальскі, Светласельскі, Сіроцінскі, Язвінскі.

Тэр. раёна пераважна ў межах *Полацкай нізіны*, усх. і паўд.-ўсх. часткі ў межах *Гарадоцкага ўзвышша*. Паверхня пераважна раўнінная, 85% яе на выш. 130—150 м, 13% на выш. 150—170 м. Найвыш. пункт 177 м (за 2 км на Пн ад в. Лескавічы). Агульны нахіл паверхні з У на З. Карысныя выкапні: торф, гліны і суглінкі, пяскі, пясчана-жвіровы матэрыял. Сярэдняя т-ра студз. -7,6 °С, ліп. 17,9 °С. Ападкаў 620 мм за год. Вегетац. перыяд 184 сут. Найб. р. Зах. Дзвіна з прытокамі Обаль (з Усысай і Чарняўкай) і Сечна. Найб. азёры: Будавесць, Дабееўскае, Мошня, Лескавічы, Сосна, Расалай, Мошна, Заронава (на мяжы з Віцебскім р-нам). Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя

(79%), дзярнова-падзолістыя (14,1%) і інш. Пад лесам 47,8% тэр. Пераважаюць хваёвыя, бярозавыя, яловыя, шэра- і чорнаальховыя, асінавыя лясы; трапляюцца дубовыя, кляновыя, ясянёвыя; штучныя насаджэнні (каля 3%) пераважна хваёвыя. Пад балотамі 10,2% плошчы. Найб. балотныя масівы: Обаль-2, Дабееўскі Мох, Обаль-1, Ямішча, Чарніцкае балота, Чорны Мох. На тэр. раёна заказнікі рэсп. значэння: ландшафтны *Казьянскі* (частка), гідралагічны *Сосна*. Ахоўны тарфянік Малахаў Мох. Помнікі прыроды рэсп. значэння: валун «Вялікі камень» у в. Горкі і валуны ў вёсках Гараватка і Шавекі.

Агульная пл. с.-г. угоддзяў 58,7 тыс. га, з іх асушаных 24,5 тыс. га. На 1.1.2003 у раёне 12 калгасаў, 5 калект. унітарных с.-г. прадпрыемстваў, племптушкараэпрадуктар, 24 фермерскія гаспадаркі. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, вырошчванні збожжавых і кармавых культур, лёну, бульбы. Прадпрыемствы прам-сці: харч. (сыры, масла, цэльнамалочныя прадукты і інш.), каап. (хлебабулачныя вырабы), буд. матэрыялаў (цэгла), перашаснай апрацоўкі лёну (ільновалакно); лясгас. Па тэр. раёна праходзяць чыгунка Віцебск—Полацк, аўтадарогі Віцебск—Полацк, Гарадок—Лепель. У раёне 13 сярэдніх, у т.л. 3 школы-сады; 6 базавых, у т.л. 2 школы-сады; 5 пач. школ, у т.л. 3 школы-сады; школа-інтэрнат, 16 дашкольных устаноў, 24 клубныя ўстановы, 28 б-к, 4 бальніцы, амбулаторыя, 16 фельч.-ак. пунктаў. *Шумілінскі гісторыка-краязнаўчы музей*. Помнікі архітэктуры: цэрквы — Сергіеўская (канец 19 — пач. 20 ст.) у в. Лескавічы, Успенская (канец 19 ст.) у в. Пабеда. Выдаецца газ. «Герой працы».

Літ.: Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Віцебская вобл. Мн., 1985; Память: Ист.-док. хроника Шумилинского р-на. Мн., 1985. *В.П.Аўчыннікава, Г.С.Смалякоў.*

ШУ́МНЫЯ ГУ́КІ, гл. ў арт. *Зычныя гукі*.

ШУ́МПЕТЭР (Schumpeter) Іозеф (8.2.1883, г. Тршэшць, Чэхія — 18.1.1950), аўстрыйскі і амерыканскі эканаміст і сацыёлаг. Скончыў Венскі ун-т. У 1919—20 міністр фінансаў Аўстр. рэспублікі. З 1925 праф. Бонскага, з 1932 Гарвардскага ун-таў. Асн. працы: «Тэорыя эканамічнага развіцця» (1912), «Дзелавыя цыклы» (1939), «Капіталізм, сацыялізм і дэмакратыя» (1942). Эканам. аналіз грамадства спалучаў з сацыялагічным. Распрацаваў канцэпцыю эканам. дынамікі і цыклаў, дзе вырашальную ролю ў эканам. развіцці адводзіў прадпрымальніцтву, якое трактаваў як дзейнасць, што робіць стаўку на асабістую ініцыятыву. На аснове аналізу кругаабароту капіталу вылучыў асаблівую прадпрымальніцкую функцыю, якая заключаецца ў ажыццяўленні арганізац.-гасп. інавацыі, «новых камбінацыйных фактараў вытворчасці». Прадпрымальнікі, на яго думку, не ўтвараюць асобнай прафесіі ці класа, а адрозніваюцца толькі прадпрымальніцкай функцыяй, якая рэалізуецца з мэтай атрымання прыбытку. Вылучыў 3 мэтавыя моманты ў дзейнасці прадпрымальніка: патрэбнасць у панаванні, уладзе, уплыве; воля да перамогі, імкненне да поспеху ў барацьбе з сапернікамі і з самім сабой; радасць творчасці, якую дае самаст. вядзенне спраў. Сцвярджаў, што прадпрымальнік — асн. суб'ект, цэнтр. сац. механізм эканам. развіцця ў грамадстве рыначнага тыпу, але прыйшоў да высновы пра непазбежнасць паступовай трансфармацыі прыватнапрадпрымальніцкага капіталізму ў эканам. сістэму, развіццё якой будзе рэгулявацца і накіроўвацца дзяржавай. *Я.М.Бабосаў.*

ШУ́МСКАЯ Лізавета Уладзіміраўна (12.4.1905, г. Іванава, Расія — 1988), расійская спявачка (лірыка-каларатурнае сапрана), педагог. Нар. арт. Расіі (1951). Скончыла Іванаўскае муз. вучылішча (1934). Займалася ў Д.Бяляўскай у Маскве. З 1928 спявала на оперных сцэнах рас. гарадоў. З 1944 салістка Вял. т-ра ў Маскве. З 1959—75 выкладала ў Маскоўскай кансерваторыі. Адна з выдатных сав. спявачак. Яе выкананне вылучалася тонкасцю фразіроўкі, цеплынёй, задушэўнасцю. Сярод партый: Валхава, Снягурачка («Садко», «Снягурачка» М.Рымскага-Корсакава), Антаніда («Іван Сусанін» М.Глінкі), Джульета («Рамэо і Джульета» Ш.Гуно). Дзярж. прэмія СССР 1950.

ШУ́МСКІ (сапр. Ш о м і н) Юрый Васілевіч (17.11.1887, г. Цірасполь, Малдова — 7.6.1954), украінскі акцёр, рэжысёр. Нар. арт. СССР (1944). У 1917—20 у Херсоне арганізаваў аматарскія ўкр. т-р і студыю. З 1925 працаваў у т-ры «Дзярждрама» ў Адэсе, з 1934 ва Укр. драм. т-ры імя І.Франко ў Кіеве. Сярод найб. значных роляў: Галушка, Багдан Хмяльніцкі («У стэпах Украіны», «Багдан Хмяльніцкі» А.Карнейчука), Хлестакоў, Гараднічы («Рэвізор» М.Гогаля), Барыс Гадуноў («Барыс Гадуноў» А.Пушкіна), Клод («Сабор Парыжскай Божай маці» паводле В.Гюго), Філіп II («Дон Карлас» Ф.Шылера), Швандзя («Любоў Яравая» К.Транёва) і інш. Творчая манера Ш. вызначалася высокай рэаліст. выразнасцю, прастатой, лёгкасцю і натуральнасцю выканання. Паставіў спектаклі «Ягор Булычоў і іншыя» М.Горкага (1932; і роля Ягора), «Утаймаванне свавольніцы» У.Шэкспіра (1934; і роля Петручыо). Здымаўся ў кіно. Дзярж. прэміі СССР 1950, 1951.

Літ.: Й о с и п е н к о Н.К. Ю.В.Шумский. Киев, 1960.

ШУ́МСКІ Якаў Данілавіч (1732 — 3.12.1812), рускі акцёр, педагог. Паплечнік Ф.Р.*Волкава*. У 1740-я г. ўдзельнічаў у стварэнні т-ра ў Яраслаўлі. У 1752 разам з акцёрамі гэтага т-ра запрошаны ў Пецярбург і залічаны ў прыдворную трупу. З 1756 акцёр першага пастаяннага рус. публічнага т-ра. З 1764 выкладаў у АМ і кіраваў аматарскім т-рам вучняў. Яго творчасці ўласцівы самабытны прыродны камізм, здольнасць да імправізацыі; на сцэне смела парадольваў умоўнасці класіцызму. Выступаў пераважна ў ролях слуг і маладых свавольнікаў: Ерамееўна («Недаростак» Дз.Фанвізіна), Васіль («Мот, каханнем выпраўлены» У.Лукіна), Созій, Скапэн («Амфітрыён», «Хітрыкі Скапэна» Мальера), Майсей («Школа зласлоўя» Р.Шэрыдана) і інш.

Літ.: А с е е в Б.Н. Русский драматический театр XVII—XVIII вв. М., 1958.

ШУНЕ́ЙКА Яўген Феліксавіч (н. 5.5.1954, г. Гродна), бел. мастацтвазнавец, мастак дэкар.-прыкладнога мастацтва. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1978). З 1980 працаваў у Гродзенскім абл. навук.-метадычным цэнтры нар. творчасці, выкладаў у Рэсп. школе-інтэрнаце па музыцы і выяўл. мастацтве, з 1986 заг. аддзела Бел. фонду культуры. З 1989 выкла-

дае ў Бел. АМ (з 1999 дацэнт). Даследуе тэорыю і гісторыю, сучаснае бел. мастацтва, у т.л. народнае (набіўныя тканіны). Выканаў габелены: «М.Багдановіч» (1981, Дом-музей М.Багдановіча ў Гродне), «Нараджэнне паэтаў» (1983, Дом літаратараў у Мінску), «Вясна Панямоння» (1986, гар. б-ка імя Карскага ў Гродне) і інш. Адрэстаўрыраваў 200 арнаментальных матываў бел. нар. набіванак канца 19 — пач. 20 ст.

Тв.: Арганізацыя вытворчасці беларускіх набіванак з XVI—XVII ст. // Помнікі мастацкай культуры Беларусі: Новыя адкрыцці. Мн., 1989.

ШУНТ (ад англ. shunt адгалінаванне) у электратэхніцы, электрычны праваднік (ці магнітаправод), далучаны паралельна ўчастку эл. (магн.) ланцуга для адгалінавання часткі эл. току (магн. патоку) у абход дадзенага ўчастка. Выкарыстоўваецца пераважна для пашырэння межаў вымярэння *вымяральных прылад*.

ШУНЯКО́Ў Леанід Іванавіч (н. 24.11.1936, в. Круглаўка Руднянскага р-на Смаленскай вобл., Расія), бел. канструктар і арганізатар вытв-сці сродкаў выліч. тэхнікі. Засл. работнік прам-сці Беларусі (1976). Скончыў БПІ (1958). З 1959 на Мінскім ВА выліч. тэхнікі (з 1971 нам. гал. інжынера). З 1978 гал. інжынер навуч. цэнтра «Алгарытм». У 1981—96 нач. аддзялення, вядучы канструктар Мінскага НДІ ЭВМ. Навук. працы ў галіне вытв-сці і выкарыстання выліч. тэхнікі. Удзельнічаў ва ўкараненні ў серыйную вытв-сць ЭВМ шырокага выкарыстання тыпу «Мінск» і Адзінай сістэмы, выліч. сродкаў спец. прызначэння. Дзярж. прэмія СССР 1970. *М.П.Савік.*

ШУПЕ́НЬКА Генадзь Серафімавіч (н. 6.4.1936, в. Падбярэззе Мядзельскага р-на Мінскай вобл.), бел. крытык і літаратуразнавец. Скончыў БДУ (1965). З 1969 працаваў у НДІ педагогікі Мін-ва асветы Беларусі, у 1979—2001 у выд-ве «Мастацкая літаратура» (у 1982—96 заг. рэдакцыі). Яго кнігі нарысаў, літ. партрэтаў, артыкулаў «Цеплыня чалавечнасці» (1977), «Галоўнае — талент» (1987) прысвечаны праблемам маст. майстэрства, творчай індывідуальнасці пісьменніка, творчасці Я.Брыля, А.Васілевіч, Н.Гілевіча, І.Мележа, П.Місько, І.Пташнікава, Я.Скрыгана, В.Хомчанкі, Ф.Янкоўскага і інш. Пераклаў на бел. мову аповесці «Мілы ба-пэр!» Ц.Дзеры (1983), «Кат» П.Лагерквіста (1986, з М.Гілем) і інш.

Тв.: Прага мастацкасці: Выбранае. Мн., 1996.

«ШУПЛЯ́ДКА», «Шуфлядка», бел. народны танец, разнавіднасць *кадрылі*. Муз. памер 6/8. Тэмп жвавы. Выконваецца 2 парамі. Зафіксаваны ў канцы 19 ст. ў Сакольскім пав. Гродзенскай губерні.

ШУР (Schur) Ісаі (10.1.1875, г. Магілёў — 10.1.1941), нямецкі матэматык, адзін са стваральнікаў тэорыі выяўленняў груп; заснавальнік навук. школы. Чл. Прускай АН (1922—38). Чл.-кар. АН СССР (1929). Скончыў Берлінскі ун-т (1901), дзе і працаваў у 1903—11 і 1916—35 (з 1916 праф., з 1919 заг. кафедры); у 1911—16 праф. Бонскага ун-та. З 1939 у Палесціне. Навук. працы па тэорыі груп, рыманавых разнастайнасцях, тэорыі лікаў і функцый. Сфармуляваў лему аб сплятаючым аператары для канечнамерных непрыводных выяўленняў груп і алгебраў (лема Ш., 1906). Даказаў тэарэмы аб унітарнай трыянгулярызацыі матрыц (1910), прасторах пастаяннай крывізны, існаванні камутатыўнай падалгебры поўнай матрычнай алгебры і інш., якія названы яго імем.

М.М.Касцюковіч.

Я.Ш.**Шур**.



П.І.**Шурухін**.

ШУР Якаў Шэбселевіч (20.4.1908, г. Дуброўна Віцебскай вобл. — 24.5.1986), расійскі фізік, адзін са стваральнікаў уральскай навук. школы магнітолагаў. Чл.-кар. АН СССР (1970). Скончыў Ленінградскі ун-т (1932). З 1932 у Ін-це фізікі металаў Уральскага навук. цэнтра АН СССР (з 1945 заг. лабараторыі). Адначасова з 1938 ва Уральскім ун-це (у 1944—72 праф.). Навук. працы па фізіцы магн. з'яў. Адкрыў з'яву тэмпературнага магн. гістэрэзісу (1948), выявіў і вывучыў анізатрапію магн. гістэрэзісу ферамагн. крышталёў. Адкрыў магн. пругкі гістэрэзіс, высветліў прыроду працэсаў намагнічвання і гістэрэзісу ў высокакаэрцытыўных магн. матэрыялах. Распрацаваў новыя магн. і магнітастрыкцыйныя матэрыялы, электратэхн. сталі з высокай магн. пранікальнасцю і малымі стратамі, магн. плёнкі. Дзярж. прэмія СССР 1967.

Тв.: Ферромагнетизм. М.; Л., 1948 (разам з С.В.Вансоўскім). *М.М.Касцюковіч.*

ШУРА́, рака ў Стаўбцоўскім р-не Мінскай вобл., левы прыток р. Уса (бас. р. Нёман). Даўж. 27 км. Пл. вадазбору 99 км^2. Пачынаецца за 1 км на Пд ад в. Дружная, упадае ў Усу за 1,8 км на ПнУ ад в. Пруды. Рэчышча на працягу 16 км (ад вытоку да в. Янкавічы) каналізаванае. Прымае сцёк з меліярац. каналаў.

«ШУРА́-І-ІСЛА́М» (араб. — савет ісламу), рэлігійна-паліт. арганізацыя джадзідаў (гл. *Джадзідызм*) у Туркестанскім краі ў 1917—18. Створана ў сак. 1917 у г. Ташкент з прадстаўнікоў інтэлігенцыі, буржуазіі, землеўладальнікаў карэнных нацыянальнасцей і мусульм. духавенства, выступала за нац.-рэліг. аўтаномію Туркестана ў складзе Расіі, падтрымлівала *Часовы ўрад*. Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 абвясціла *Какандскую аўтаномію*. У канцы 1917 — 1-й пал. 1918 «Ш.-і-І.» і яе мясц. аддзяленні распушчаны органамі сав. улады. У падполлі ўдзельнікі «Ш.-і.-І.» выступалі як арганізатары *басмацтва*.

ШУРАЛЁЎ Уладзімір Міхайлавіч (3.4.1935, г. Каўроў Уладзімірскай вобл., Расія), генерал арміі (1989). Скончыў Ваен. акадэмію бранятанк. войск (1965), Генштаба (1975). З 1975 нам. камандуючага і камандуючы танк. арміяй, 1-ы нам. глаўкома Групы сав. войск у Германіі. У 1985—89 камандуючы *Беларускай ваеннай акругай*, пазней нам. камандуючага Аб'яднанымі ўзбр. сіламі дзяржаў-удзельніц Варшаўскага дагавору, гал. інспектар інспекцыі Мін-ва абароны, нач. курсаў «Выстрал».

ШУРПА́ТАСЦЬ ПАВЕ́РХНІ ў машынабудаванні, сукупнасць мікранераўнасцей апрацаванай паверхні; характарыстыка якасці апрацоўкі гэтай паверхні. Вызначаецца з дапамогай кантактных (*прафіламетраў*, прафілографаў) ці бескантактных (аптычных) прылад, а таксама візуальным параўнаннем кантралюемай паверхні з паверхняй узору з вядомай шурпатасцю.

Апісваецца наборам параметраў, якія характарызуюць сярэднія і найбольшыя вышыні нераўнасцей і іх шырыні, адлегласці паміж імі і інш. Уплывае на эксплуатацыйныя характарыстыкі дэталей: зноса- і каразійную ўстойлівасць, каэфіцыент трэння і інш. Значэнні параметраў Ш.п. для розных тыпаў вырабаў і ўмоў іх эксплуатацыі ўстанаўліваюцца стандартамі. Тэрмін уведзены ў 1980 дзярж. стандартам замест тэрміна *класы чысціні*.

ШУРУ́ХІН Павел Іванавіч (18.11.1912, с. Салёны Ерык Быкаўскага р-на Валгаградскай вобл., Расія — 3.11.1956), двойчы Герой Сав. Саюза (1943, 1945). Ген.-маёр (1953). У Чырв. Арміі з 1931. Скончыў Арджанікідзеўскую ваен. школу (1934), курсы камандзіраў стралк. дывізій пры Ваен. акадэміі імя Фрунзе (1950). Удзельнік сав.-фінл. вайны 1939—40. У Вял. Айч. вайну камандаваў стралк. батальёнам на Зах. фронце (1941), партыз. атрадам у Гомельскай вобл. (1941—42), аб'яднаным партыз. атрадам у Арлоўскай вобл. (1942—43); з ліп. 1943 і да канца вайны — гвардз стралк. палком на Варонежскім, 1-м і 2-м Укр. франтах. Пасля вайны на камандных пасадах у Сав. Арміі.

ШУРФ (ням. Schurf), вертыкальная, часам нахіленая падземная *горная выработка* з выхадам на паверхню. Мае прамавугольнае, квадратнае ці круглае (дудка) сячэнне, невял. (звычайна да 25 м) глыбіню. Робіцца з зямной паверхні для разведкі радовішчаў карысных вы-

капняў, археал. разведкі, вентыляцыі, водаадліву, выбуховых работ і інш.

ШУ́РЫЦА, рака ў Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., левы прыток р. Галбіца (бас. р. Зах. Дзвіна). Даўж. 20 км. Пл. вадазбору 70 км^2. Пачынаецца за 1,5 км на ПдЗ ад в. Карпавічы, вусце за 500 м на Пн ад в. Галбея. Цячэ праз Старадворскае воз., пасля выхаду з яго рэчышча на працягу 7,8 км да вусця каналізаванае. У сярэднім і ніжнім цячэнні праходзіць па лясістай мясцовасці.

ШУ́СЦЕР (Schuster) Рудольф (н. 4.1.1934, г. Кошыцы, Славакія), дзяржаўны і паліт. дзеяч Славакіі. Д-р эканам. н. (1997). Скончыў Славацкую вышэйшую тэхн. школу ў Браціславе (1959). Да 1962 у розных НДІ Браціславы, потым на кіруючых пасадах у гаспадарцы і чыг. транспарце г. Кошыцы; з 1986 мэр Кошыц. З 1987 старшыня Усходнеславацкага краявога нац. к-та, з 1989 — Славацкага Нац. Савета (парламент). У 1990—92 пасол Чэхіі і Славакіі ў Канадзе, потым у МЗС Славакіі. З 1994 зноў мэр Кошыц. Заснавальнік і лідэр (з 1998) Партыі грамадз. згоды. Прэзідэнт Славакіі з мая 1999. Прыхільнік паскоранай інтэграцыі краіны ў НАТО і Еўрап. Саюз. *Н.А.Царук.*

Р.Шусцер.

М.К.Шут.

ШУТ Іван Віктаравіч (н. 15.12.1932, в. Паланэчка Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне прыладабудавання. Канд. тэхн. н. (1989), праф. (1993). Скончыў БПІ (1956). З 1956 на прамысл. прадпрыемствах Мінска. З 1991 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі. Навук. працы па тэхналогіі радыёэлектроннай апаратуры. Распрацаваў навук. прынцыпы пабудовы тэхн. сродкаў аўтаматызацыі і іх метралагічнага забеспячэння, мадэлі і метады групавой тэхналогіі рэгуліроўкі і кантролю радыёэлектронных сродкаў.

Тв.: Некоторые аспекты технологии изготовления цифровых вольтметров // Приборостроение. 1987. №9; Интегрированная система АСНИ-САПР-АСТПП-АСУП-ГПС в мелкосерийном многономенклатурном производстве РЭС. Мн., 1991.

ШУТ Кліменцій Пятровіч (1925, Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл. — 7.1.1969), бел. археолаг. Скончыў БДУ (1960). Працаваў у Ін-це гісторыі АН Беларусі. У 1959—61 удзельнічаў у археал. экспедыцыі па даследаванні стараж. Мінска. З 1963 даследаваў гарадзішчы ранняга жал. веку на Пн Беларусі. Правёў раскопкі на гарадзішчах Кублічы, Загавалін Ушацкага, Кастрыца Лепельскага, Урагава і Абрамава Верхядзвінскага, Буракова (Новы Болецк) Гарадоцкага р-наў; на многіх інш. гарадзішчах правёў шурфоўку. Адкрыў і ўвёў у навук. ўжытак больш за 10 археал. помнікаў. Падрыхтаваў археал. карту паўн. Беларусі са спісам гарадзішчаў.

Тв.: Городище Дворище // Вопросы истории и археологии. Мн., 1966; Памятники раннего железного века на севере Белоруссии // Древности Белоруссии. Мн., 1966; Городище Кубличи Ушачского района // Древности Белоруссии. Мн., 1969. *В.І.Шадыра.*

ШУТ Мікалай Канстанцінавіч (30.12.1916, г.п. Плешчаніцы Лагойскага р-на Мінскай вобл. — 30.3.1977), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Мінскі аэраклуб, Барысаглебскую школу ваен. лётчыкаў (1938), вышэйшую авіяшколу (1945). У Чырв. Арміі з 1938. Удзельнік баёў на р. Халхін-Гол у 1939. У Вял. Айч. вайну са снеж. 1941 на Крымскім, Паўн.-Каўказскім, Варонежскім, Сцяпным, 1-м і 2-м Укр., Далёкаўсх. франтах. Удзельнік вызвалення Румыніі, Берлінскай і Пражскай аперацый 1945, вайны з Японіяй 1945. Лётчык маёр Ш. да вер. 1943 зрабіў 315 баявых вылетаў, асабіста збіў 14, у групе 1 самалёт праціўніка, да канца вайны — 414 баявых вылетаў, збіў 22 самалёты. Да 1949 у Сав. Арміі, потым у нар. гаспадарцы.

ШУ́ТАВА Вольга Паўлаўна (15.2.1944, в. Загародная Камянецкага р-на Брэсцкай вобл. — 26.11.1999), бел. спявачка (альт). Засл. арт. Беларусі (1973). Скончыла Усерас. творчую майстэрню эстр. мастацтва ў Маскве (1972). Творчы шлях пачала ў маст. самадзейнасці. У 1968—96 салістка Бел. філармоніі. Яе творчасці ўласцівы задушэўнасць у перадачы эмацыянальнага зместу песень, у т.л. народных. У рэпертуары пераважалі творы бел. і рас. кампазітараў, бел. нар. песні. *Л.С.Мітаковіч.*

ШУ́ТАЎ Альфрэд Пятровіч (н. 19.2.1932, б. хутар Дубовы Лес Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл.), бел. дзеяч самадзейнага мастацтва. Засл. работнік культ. Беларусі (1975). Скончыў Мінскае муз. вучылішча імя М.Глінкі (1963). З 1958 арганізатар і кіраўнік Брэсцкага нар. хору Палаца культуры прафсаюзаў. У 1980—89 кіраваў хар. калектывам пры Парку культуры і адпачынку Брэста. Аўтар песень і апрацовак бел. нар. песень.

ШУ́ТАЎ Генадзь Майсеевіч (29.3.1939, Мінск — 29.12.1995), бел. вучоны ў галіне тэхналогіі апрацоўкі драўніны. Д-р тэхн. н. (1983), праф. (1984). Скончыў Бел. тэхнал. ін-т (1961). З 1963 у Бел. тэхнал. ун-це (з 1973 заг. н.-д. лабараторыі, з 1981 заг. кафедры). Навук. працы па даследаванні фіз.-мех. уласцівасцей натуральнай і мадыфікаванай палімерамі драўніны. Распрацаваў спосабы і спец. тэхналогіі атрымання біялагічна-, хімічна- і вогнеўстойлівай драўніны і драўняных матэрыялаў.

Тв.: Основы технологии полимерных строительных материалов. 2 изд. Мн., 1981 (у сааўт.); Деревянные конструкции и детали: Справ. строителя. 2 изд. М., 1983 (у сааўт.); Метод описания прочности древесностружечных плит с использованием теории фракталов (разам з М.І.Кулаком) // Изв. вузов. Лесной журн. 1992. №3. *Я.Г.Міляшкевіч.*

ШУ́ТАЎ Генадзь Фёдаравіч (н. 18.7.1939, г. Запарожжа, Украіна), бел. графік, акварэліст. Засл. дз. маст. Беларусі (1996). Скончыў Маскоўскі паліграф. ін-т (1970). У 1976—86 старшыня праўлення Віцебскай абл. арг-цыі Саюза мастакоў Беларусі. Працуе пераважна ў акварэлі ў жанрах нацюрморта і пейзажа. Раннія творы арыентаваны на традыц. рэаліст. натурныя прыёмы акварэльнага пісьма, вылучаюцца разгорнутай апавядальнасцю, рамант. інтанацыямі: «Восень у вёсцы» (1956), «Палявыя кветкі» (1963), «Стары Віцебск» (1967), «Зялёны шум» (1974); серыі «Віцебск» (1972), «Шклозавод «Нёман» (1973), «Наваполацкі нафтаперапрацоўчы завод», «Мой горад» (абедзве 1972—75), «Па Венгрыі», «Масква» (абедзве 1976), «Зямля беларуская» (1977), «Новабудоўлі Беларусі» (1978), «Па Азербайджане» (1979), «Польшча» (1980), «Рускі самавар» (1984). Пазнейшым творам уласціва своеасаблівая аўтарская тэхніка, філасафічнасць і сімвалічная знакавасць, жывапіснасць і пластычная вытанчанасць форм, рытмічная раўнавага: нацюрморты «Нацюрморт з вэнджанай рыбінай» (1983), «Сланечнікі ў чорным жбане» (1988), «Рыбы і ракавіны» (1991), «Сем лямпаў» (1994), «Маці прысвячаецца» (2000), «Патухлая лямпа Шагала» (2002); серыі «Дарункі зямлі беларускай» (1985—86), «Матэрыя мастацтваў» (1999), «Пралам-

Г.Шутаў. Вось гэтыя кветкі ўмеюць лятаць. 1996.

ленне» (2002), серыі пейзажаў «Зялёна-Гура», «Брэсцкая крэпасць», «Сілуэты Кіева» (усе 1981), «Помнікі архітэктуры Віцебшчыны» (1986—87), «Віцебскія дворыкі» (2003). *М.Л.Цыбульскі.*

ШУ́ТАЎ Сцяпан Фёдаравіч (30.1.1902, в. Дварэц Глускага р-на Магілёўскай вобл. — 17.4.1963), двойчы Герой Сав.

С.Ф.Шутаў.

У.Р.Шухаў.

Саюза (студз., вер. 1944). Палкоўнік (1944). Скончыў Аб'яднаную ваен. школу імя ВЦВК (1927), Бранятанк. курсы ўдасканалення камсаставу (1932 і 1933), Акад. курсы ўдасканалення камсаставу (1937 і 1943). Са снеж. 1917 у Гарадоцкім і Асіповіцкім атрадах Чырв. гвардыі, з мая 1918 партызан у Бабруйскім пав., з ліп. 1920 у Чырв. Арміі на Зах. фронце. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Зах., Волхаўскім, Варонежскім, 1-м і 2-м Укр. франтах: камандзір танк. батальёна, палка, брыгады, нам. камандзіра механіз. корпуса. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра і вызваленні Кіева (1943), у Яска-Кішынёўскай аперацыі 1944. У вер. 1944 цяжка паранены. З 1945 у адстаўцы. Дэп. Вярх. Савета СССР у 1946—50, Вярх. Савета БССР у 1951—55. У г.п. Глуск пастаўлены бронзавы бюст. Яго імем назв. Гарадоцкая сярэдняя школа ў Глускім р-не. Аўтар кн. «Чырвоныя стрэлы» (1963).

Літ.: Люди бессмертного подвига. Кн. 2. 4 изд. М., 1975.

ШУТО́ВІЧ Янка (Іван Іосіфавіч; 24.1.1904, в. Шутавічы Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл. — 9.12.1973), бел. грамадскі і культурны дзеяч, літаратуразнавец. Скончыў віленскія бел. гімназію (1924), ун-т (1934). У час вучобы ва ун-це прымаў удзел у працы Бел. студэнцкага саюза, Бел. навук. т-ва, Т-ва прыяцеляў беларусаведы, Бел. ін-та гаспадаркі і культуры, рэдагаваў час. «Студэнцкая думка», «Шлях моладзі». Адзін з кіраўнікоў Бел. нац. аб'яднання (гл. *Беларуская хрысціянская дэмакратыя*). Працаваў у Бел. друкарні імя Ф.Скарыны. У 1935—39 адказны рэдактар і выдавец час. «*Калоссе*». У 1936 кіраваў агульным Школьным сакратарыятам. Быў зняволены польскімі ўладамі, вызвалены сав. войскамі ў 1939. З восені 1939 займаўся асв. і выдавецкай дзейнасцю, з 1940 працаваў у Бел. музеі ў Вільні (з 1941 дырэктар). У 1944 рэпрэсіраваны, вызвалены ў 1956, рэабілітаваны ў 1958. Жыў у Вільнюсе. Друкаваўся з 1927. Выступаў з артыкуламі пра Я.Драздовіча, Ш.Руставелі, Т.Шаўчэнку, рыхтаваў матэрыялы пра М.Гарэцкага, А.Гурыновіча, М.Забэйду-Суміцкага, Я.Карскага, А.Уласава, Бел. музей у Вільні. У 1940 пад яго рэд. у Вільні выдадзена кн. «Ксёндз Адам Станкевіч: У 25-я ўгодкі свяшчэнства і беларускай нацыянальнай дзейнасці (10.1.1915 — 10.1.1940)». Выявіў у архіве рукапіс рамана Гарэцкага «Віленскія камунары». Рукапісны і ўласны архіў Ш. захоўваецца ў Цэнтр. навук. б-цы Нац. АН Беларусі. *А.М.Вабішчэвіч*

ШУТЦ, Ш у ц (Schütz) Генрых (лацінізаванае Henricus Sagittarius; 14.10.1585, Кёстрыц, Германія — 6.11.1672), нямецкі кампазітар эпохі барока, капельмайстар, арганіст, педагог; заснавальнік ням. нац. кампазітарскай школы. Вучыўся ў Дж. Габрыэлі (1609—13; Венецыя). Быў прыдворным капельмайстрам у Каселі, Дрэздэне, Капенгагене і інш. У 1657 атрымаў ганаровае званне прыдворнага капельмайстра. У сваёй творчасці выкарыстаў дасягненні італьян. харавой (шматхорнага канцэртавання «венецыянскіх» майстроў), інстр. і сцэн. музыкі, абапіраўся на традыцыі ням. духоўнай і нар. музыкі. Аўтар першых ням. оперы «Дафна» (паст. 1627) і балета «Арфей і Эўрыдыка» (паст. 1638, не захаваліся). Пісаў мадрыгалы, духоўную музыку, у т.л. «страсці», псалмы, матэты. Стваральнік кантатна-аратарыяльнага жанру ў Германіі, які паўплываў на І.С.Баха і Г.Ф.Гендэля. Сярод яго вучняў аўтар трактата па кампазіцыі К.Бернгарт.

Літ.: Захарова О. Риторика и западноевропейская музыка XVII — первой половины XVIII вв. М., 1983; Штейнгард В. Генрих Шютц: Очерк жизни и творчества. М., 1980; Генрих Шютц: Сб. ст. М., 1985. *Н.В.Сазановіч.*

ШУ́ТЭ (ням. Schütte), хвароба ігліцы хвойных пародаў дрэў, якая выклікаецца фітапатагеннымі грыбамі. Пашырана паўсюдна. На Беларусі найб. шкаданосныя Ш. звычайнае (узбуджальнік — сумчаты грыб лафадэрміум хваёвы) і Ш. снежнае хвоі (узбуджальнік — фацыдый інфэстанс). Найб. шкодзяць усходам і сеянцам. Пры звычайным Ш. ігліца жаўцее, бурэе, ападае; пры снежным Ш. вясной з'яўляецца павуцініста налёт, потым ігліца бурэе і гіне. Крыніца інфекцыі — хворыя расліны і апад заражанай хвоі. Развіццю хваробы спрыяюць цёплае дажджлівае надвор'е, парушэнні правіл сяўбы і пасадкі дрэў у гадавальніках.

ШУТЭ́НКА Гаўрыіл Карнеевіч (24.6.1924, с. Арзгір Стаўрапольскага краю, Расія — 11.7.2002), бел. паэт. Скончыў Вышэйшыя літ. курсы пры Літ. ін-це імя М.Горкага ў Маскве (1964). Страціў зрок на фронце ў Вял. Айч. вайну. Працаваў ва ўстановах Бел. т-ва сляпых. Друкаваўся з 1939. Пісаў на рус. мове. У паэт. зб-ках «Мае вочы» (1961), «Памяць» (1969), «Смага» (1974), «Сонца на вейках» (1984), «Гарыць вогнішча ўспамінаў» (1990) Вял. Айч. вайна, услаўленне Радзімы, ваен. і прац. подзвігу народа. Аўтар кн. для дзяцей «Наша кацяня Дзімурлы» (1978). Асобныя вершы Ш. пакладзены на музыку.

ШУ́ХАРТ (Schuchardt) Гуга (4.2.1842, г. Гота, Германія — 21.4.1927), нямецкі і аўстрыйскі мовазнавец. Вучыўся ва ун-тах Іены і Берліна. Праф. ун-таў у Гале (з 1873) і Грацы (1876—1900). Вывучаў праблемы раманскай філалогіі і агульнага мовазнаўства, нар. латынь («Вакалізм народнай латыні», т. 1—3, 1866—68; «Аб фанетычных законах», 1885; «Раманскія этымалогіі», ч. 1—2, 1898—99). Выказаў ідэю «моўнага змешвання», узаемадзеяння лексікі і граматыкі. Лічыў неабходным вывучаць слова ў сувязі з гісторыяй яго паходжання. Выступаў з крытыкай гукавых законаў младаграматыкаў, схемы генеалагічнай класіфікацыі індаеўрап. моў А.*Шлайхера*.

Тв.: Рус. пер. — Избранные статьи по языкознанию. М., 1950.

ШУ́ХАЎ Уладзімір Рыгоравіч (28.8.1853, г. Грайваран Белгародскай вобл., Расія — 2.2.1939), расійскі інжынер-вынаходнік і вучоны ў галіне тэхнікі і будаўніцтва. Ганаровы акад. АН СССР (1929), засл. дз. нав. і тэхн. РСФСР (1928). Герой Працы (1932). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча (1876). З 1878 гал. інжынер тэхн. буд. канторы ў Маскве. Пасля 1917 на з-дзе «Парастрой» (Масква). Навук. працы па тэхніцы нафтавай прам-сці, цеплатэхніцы і буд. справе. Зрабіў разлік першага ў Расіі нафтаправода і кіраваў яго буд-вам, стварыў першы ў свеце мазута-

1 2 3

Шутэ звычайнае хвоі: 1 — пашкоджаны сеянец; 2 — ігліца з пікнідамі і апатэцыямі ўзбуджальніка; 3 — павялічаны фрагмент пашкоджанай ігліцы.

правод з падаграваннем. Упершыню ў свеце ажыццявіў прамысл. факельнае спальванне вадкага паліва з дапамогай вынайдзенай ім распыльвальнай форсункі (1880). Вынайшаў крэкінг-працэс (гл. *Крэкінг*). Стварыў канструкцыі вадатрубных паравых катлоў. Па яго праектах пабудавана каля 200 вежаў арыгінальнай канструкцыі (у т.л. Шабалаўская радыёвежа ў Маскве), каля 500 мастоў (у т.л. праз Аку і Волгу, Енісей), маякі і інш. Прэмія імя Леніна 1929.

Літ.: Лопатто А.Э. Почетный академик В.Г.Шухов — выдающийся русский инженер. М., 1951; Лейбензон Л.С. В.Г.Шухов // Люди русской науки. М., 1965.

ШУХРА́Т (сапр. Алімаў Гулям Амінжанавіч; 19.4.1918, Ташкент — 23.6.1995), узбекскі пісьменнік. Нар. пісьменнік Узбекістана (1985). Скончыў Ташкенцкі пед. ін-т (1940). Працаваў у перыяд. выданнях. Раман «Гады ў шынялях» (1958) пра ўдзел узб. народа ў 2-й сусветнай вайне, у рамане «Золата не ржавее» (1967) высакароднасць прафесіі настаўніка. Аўтар паэт. зб. «Лірыка» (1973), рамана «Шукальнікі раю» (1968), драм «Зяць на пяць дзён» (1970), «Жывіце доўга» (1971), «Дачка мая» (1973) і інш. Перакладаў на ўзб. мову, у т.л. творы А.Міцкевіча. На бел. мову яго асобныя творы пераклалі В.Адамчык, К.Кірэенка, А.Лойка, С.Шушкевіч.

Х.Абдуназар.

ШУЦБУ́НД (ням. Schutzbund Саюз абароны), Рэспубліканскі Шуцбунд, ваенізаваная арг-цыя С.-д. партыі Аўстрыі (СДПА) у 1920—30-я г. Засн. ў 1923/24 з атрадаў па падтрыманні парадку і розных рабочых дружын, што існавалі з 1918. Сваёй задачай лічылі абарону дэмакр. рэспублікі і процістаянне прафаш. *Хаймверу*. У 1928 налічваў 80 тыс. чал.; быў арганізаваны на федэральным і мясц. узроўнях. Яго ўзначальваў І.Дойч; у кіраўніцтва ўваходзілі таксама О.*Бауэр*, Т.*Кёрнер*, Р.Бернашэк і А.Айфлер. У 1927 і 1931 рэарганізаваны. У 1933 распушчаны ўрадам Э.*Дольфуса*, але працягваў дзейнічаць у падполлі да 1934, у т.л. быў асн. сілай с.-д. ўзбр. паўстання ў лют. 1934 у Вене, Лінцы і інш. гарадах краіны.

Літ.: Мочалин Д.Н. Вена на баррикадах. М., 1964. *У.Я.Калаткоў.*

ШУЦКО́Р (фін. suojeluskunta, швед. skyddskår ахоўны корпус), масавая ваенізаваная арг-цыя і рух у Фінляндыі ў 1918—44. Узнік пасля Люта. рэвалюцыі 1917 у Расіі як мясц. ахоўныя атрады (у некат. мясцовасцях наз. пажарныя каманды). У час грамадз. вайны ў Фінляндыі (гл. *Фінляндская рэвалюцыя 1918*) — урадавыя войскі (каля 70 тыс. чал., каманд. К.Г.Э.*Манергейм*). У 1919 атрымаў статус добраахвотнай арг-цыі, што забяспечвала абарону краіны (колькасць яе чл. стабілізавалася на ўзроўні амаль 100 тыс. чал.).

Меў акр. арг-цыі (22) па ўсёй Фінляндыі і аддзяленні ў многіх вёсках. У 1921 створана жаночая арг-цыя Ш. «Лота Свярд» (у 1930-я г. аб'ядноўвала каля 170 тыс. жанчын). З 1929 існавалі дзіцячыя атрады Ш. (каля 30 тыс. падлеткаў). Паводле закону аб ахове ад 22.12.1927 Ш. абвешчаны дапаможнай ч. нац. абароны. Займаўся таксама фізкульт.-спарт. і культ. дзейнасцю. У паліт. адносінах яго чл. прытрымліваліся нацыяналіст. і антыкамуніст. пазіцый. У 2-ю сусв. вайну з 1940 фармальна ўваходзіў у склад узбр. сіл (галоўнакаманд. Л.Малмберг), удзельнічаў у баях супраць сав. войск. Распушчаны паводле ўмоў сав.-фінл. перамір'я, падпісанага 19.9.1944 у Маскве.

Літ.: Юссила О., Сеппо Х., Юкка Н. Политическая история Финляндии, 1809—1995: Пер. с фин. М., 1998. *У.Я.Калаткоў.*

ШУЦЬКО́ Іван Цітавіч (20.12.1925, в. Гаць Крупскага р-на Мінскай вобл. — 31.8.1984), бел. пісьменнік. Вучыўся на Вышэйшых літ. курсах у Маскве (1963). Працаваў у калгасе, з 1958 у раённым друку. Друкаваўся з 1940. Аўтар кніг вершаў для дзяцей «Мой мяч» (1953), «Лепшая сяброўка» (1959), «Першае слова» (1964), апавяданняў «Дзедава рэліквія» (1960), «Дзіма хоча быць героем» (1965), казак «Чужая хатка» (1958), зб. вершаў, баек, мініяцюр «Са свайго пункту гледжання» (1966).

ШУШКЕ́ВІЧ Станіслаў Пятровіч (19.2.1908, в. Бакінава Дзяржынскага р-на Мінскай вобл. — 1.2.1991), бел. паэт. Засл. работнік культ. Беларусі (1983). Скончыў Бел. вышэйшы пед. ін-т (1934). З 1928 працаваў у Дзярж. б-цы Беларусі, б-цы НДІ сельскай і лясной гаспадаркі, газетах «Літаратура і мастацтва», «Калгаснік Беларусі», «Звязда», «Мінская праўда». У 1936 арыштаваны, асуджаны на 8 гадоў пазбаўлення волі. Знаходзіўся ў турме, лагеры, ссылцы. У 1949 паўторна рэпрэсіраваны, высланы на спецпасяленне ў Краснаярскі край, дзе працаваў лесарубам, у геал. экспедыцыях. Рэабілітаваны ў 1975. З 1956 у газ. «Мінская праўда», у 1958—70 заг. аддзела газ. «Літаратура і мастацтва». Друкаваўся з 1924. Чл. літ. аб'яднання «*Маладняк*». У паэт. зб-ках «Вершы» (1934), «Дарогаю вясны» (1959), «Услед за марамі» (1961), «Навальніца» (1966), «Сябрам» (1972), «Дарога ў залатую восень» (1983), «Рэха маладосці» (1984), «Сонца над маім асеннім садам» (1987) і інш. любоў да Бацькаўшчыны, паэтызацыя сяброўства, кахання, прыгажосці роднай прыроды. Аўтар кніг успамінаў «Вяртанне ў маладосць», прозы «Апавяданні пра Марата Казея» (абедзве 1968), зб. сатыры і гумару «Грушы на вярбе» (1969). Пісаў для дзяцей: зб-кі «Звярыны баль» (1936), «Лясная калыханка» (1958), «Будзільнік» (1966), «Красавік» (1977), «Казачны церам» (1983), «Казёл на верталёце» (1987) і інш. Яго творы вызначаюцца дасціпнасцю, займальнасцю, аптымізмам, прастатой выкладання, багаццем мовы.

Тв.: Выбр. тв. Т. 1—2. Мн., 1978; Выбранае: Вершы. Мн., 1988; Непаседлівыя вавёркі. Мн., 1993; Птушыны ранак: Вершы, казкі. Мн., 2001.

ШУШКЕ́ВІЧ Станіслаў Станіслававіч (н. 15.12.1934, Мінск), бел. фізік, дзярж. дзеяч. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1991). Д-р фіз.-матэм. н. (1970), праф. (1972). Засл. дз. нав. і тэхн. Беларусі (1982). Сын С.П.*Шушкевіча*. Скончыў БДУ (1956). З 1956 у Ін-це фізікі АН Беларусі, на Мінскім радыёзаводзе. У 1961—67 і 1969—90 у БДУ (з 1971 заг. кафедры, з 1986 прарэктар). У 1967—69 у Мінскім радыётэхн. ін-це (прарэктар).

С.П.Шушкевіч.

С.С.Шушкевіч.

У 1989—91 нар. дэп. СССР. У 1990—96 дэп., у 1990—91 1-ы нам. Старшыні, у 1991—94 Старшыня Вярх. Савета Рэспублікі Беларусь. З 1994 дырэктар Цэнтра паліт. і эканам. даследаванняў Еўрап. гуманітарнага ун-та (Мінск). Разам з кіраўнікамі Расіі і Украіны падпісаў *Белавежскія пагадненні 1991* аб стварэнні *Садружнасці Незалежных Дзяржаў*. Навук. працы па радыёфізіцы, оптаэлектроніцы. Адзін з аўтараў асноватворных прац па аднаэлектроннай фотарэгістрацыі. Развіў метады электроннай інтраскапіі, спосабы візуалізацыі і каардынатаадчувальныя цвердацельныя дэтэктары іанізавальных выпрамяненняў. Дзярж. прэмія Беларусі 1988.

Тв.: Основы радиоэлектроники. 2 изд. Мн., 1986 (разам з М.К.Яфімчыкам); ЭВМ и микропроцессор. Мн., 1990 (разам з Я.В.Більдзюкевічам, В.Л.Гурачэўскім); Неокоммунизм в Беларуси. Смоленск, 2002.

Літ.: Класкоўская Л., Класкоўскі А. Станіслаў Шушкевіч: Пуцявіна лёсу. Мн., 1994.

ШУ́ШНІГ (Schuschnigg) Курт фон (14.12.1897, г. Рыва, Італія — 18.11.1977), дзяржаўны і паліт. дзеяч Аўстрыі. Юрыст. Вучыўся ў Інсбрукскім ун-це. З 1927 дэп. Нац. савета. У 1932—34 міністр юстыцыі, адначасова ў 1933—34 міністр асветы. Пасля забойства Э.*Дольфуса* з 30.7.1934 федэральны канцлер Аўстрыі, адначасова міністр асветы (1934—36), абароны (1934—38), замежных спраў (1936—38). З 1936 узначальваў Айч. фронт. Пад націскам А.Гітлера і ва ўмовах неспрыяльных унутр. і знешнепаліт. абставін змушаны заключыць аўстра-герм. пагадненні 1936 і 1938, якія прывялі да яго адстаўкі (11.3.1938) і *аншлюсу* Аўстрыі. У 1941—45 зняволены ў канцлагеры Заксенхаўзен. У 1947—67 жыў у ЗША (з 1948 праф. Ка-

таліцкага ун-та ў г. Сент-Луіс). Аўтар твора «Рэквіем у чырвона-бела-чырвоным» (1978).

Літ.: Hopfgartner A. Kurt Schuschnigg: Ein Mann gegen Hitler. Graz, 1989.

У.Я.Калаткоў.

ШХА́РА, найб. высокая вяршыня ў цэнтр. ч. Галоўнага, або Водападзельнага, хр. Вял. Каўказа. Выш. 5068 м. Складзена з гранітаў і крышт. сланцаў. З паўн. схілаў спускаецца ледавік Безенгі, з паўд. — ледавік Шхара.

ШХЕ́ЛЬДА, горны масіў у цэнтр. ч. Вял. Каўказа, на ПдУ ад Эльбруса, у бас. р. Адылсу. Мае 5 вяршынь (выш. ад 4200 м да 4332 м). Складзены пераважна з гранітаў. З паўн. схілу спускаецца ледавік Шхельда даўж. каля 9 км. Альпінізм.

ШХЕ́РЫ (ад швед. skär), 1) невялікія скалістыя астравы і групы падводных скал непадалёку ад складана парэзаных марскіх берагоў у абласцях плейстацэнавага зледзянення (Фінляндыя, Швецыя, Нарвегія, Расія, Канада). 2) Пераважна затоплены неглыбокім морам ландшафт «барановых лбоў», у некаторых выпадках — затопленыя акумулятыўныя ледавіковыя формы (друмліны, камы, озы).

ШХУ́НА (ад англ. schooner), *ветразевае судна* з 2—7 мачтамі і косымі ветразямі. Вызначаецца добрай мараходнасцю, магчымасцю хадзіць крута к ветру, нешматлікасцю каманды. Бываюць трансп., прамысл., спарт. і вучэбныя. Водазмяшчэнне да 5 тыс. т. Сучасныя Ш. маюць рухавікі ўнутр. згарання для руху пры штылевым надвор'і і на вузкіх

Шасцімачтавая ветразевая шхуна «Ваёмінг» (Фінляндыя).

фарватэрах. Есць Ш.-баркі (*баркенціны*) і Ш.-брыгі (*брыганціны*). У 18—19 ст. уваходзілі ў склад парусных флатоў (як пасыльныя судны), Ш. рас. флоту мелі гарматы.

ШЦІ́БЕР (Stieber) Здзіслаў (7.6.1903, Шчакова, каля г. Явар Дольнашлёнскага ваяв., Польшча — 12.10.1980), польскі мовазнавец. Чл. Польскай акадэміі ведаў (з 1945), Польскай АН (з 1954; з 1961 кіраўнік аддзела). У 1937—45 праф. Львоўскага (з перапынкам), з 1945 — Лодзінскага, з 1952 — Варшаўскага ун-таў. Даследаваў праблемы польскага і агульнага мовазнаўства, фаналогію і дыялекталогію. Аўтар прац «Гістарычная і сучасная фаналогія польскай мовы» (1966), «Нарыс гістарычнай граматыкі славянскіх моў» (ч. 1—3, 1969—73), «Моўны свет славян» (1974). Пад яго рэдакцыяй выйшаў «Атлас кашубскай мовы і сумежных з ёю дыялектаў» (т. 1—12, 1964—75).

ШЧАГЛО́Ў-КУЛІКО́ВІЧ, Шчаглоў Мікалай Мікалаевіч (4.4.1893, Смаленшчына, паводле інш. крыніц 1896 ці 1897, Масква — 31.3.1969), бел. кампазітар, муз. і тэатр. дзеяч. Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1920-я г., кл. М.*Іпалітава-Іванава*). Працаваў на Украіне, Смаленшчыне. Адзін з арганізатараў Мінскага опернага т-ра, дырыжор яго сімф. аркестра. З 1936 рэдактар на Бел. радыё ў Мінску. У час акупацыі ўзначальваў муз. аддз. *Беларускага культурнага згуртавання*. З 1944 у Германіі ў лагерах для перамешчаных асоб, потым кіраўнік канцэртнай групы пры ням. Мін-ве па справах акупіраваных усх. тэрыторый, дырэктар і маст. кіраўнік арганізаванага ім вандроўнага Бел. т-ра эстрады. З 1950 у ЗША. У сваіх творах звяртаўся да гіст. мінулага бел. народа. Аўтар опер «Кацярына» (1941), «Лясное возера» (паст. 1942), «Усяслаў Чарадзей» (паст. 1943), аперэты «У вырай»; сімфоній, сімф. сюіт, канцэртаў, песень, рамансаў на словы Н.Арсенневай, М.Багдановіча, У.Дубоўкі, У.Жылкі, Я.Купалы і інш., твораў царк. музыкі, апрацовак бел. нар. песень, музыкі да драм. спектакляў і інш. Укладальнік «Беларускіх песенных зборнікаў» (1954, 1955, 1960), зб-каў «Калядоўшчыкі» (1961), «Родныя матывы» (1967). Аўтар тэарэт. прац «Беларуская песня» (1942, не апубл.), «Беларуская музычная культура» (1944), «Беларуская музыка: Кароткі нарыс гісторыі беларускага музычнага мастацтва» (1953), «Беларуская савецкая опера» (1957). Асабісты архіў захоўваецца ў Бел. б-цы і музеі імя Ф.Скарыны ў Лондане.

Літ.: Калубовіч А. Мікола Шчаглоў (Куліковіч) // Калубовіч А. Крокі гісторыі. Беласток; Вільня; Мн., 1993; Мдзівані Т.Г., Сергіенка Р.І. Кампазітары Беларусі. Мн., 1997. С. 387—395. *Р.І.Сергіенка.*

ШЧАДРАВА́ННЕ, у беларусаў і інш. славянскіх народаў традыцыйны звычай хадзіць на *шчадрэц* па хатах. Звычайна група моладзі са «шчодрай» — прыгожай дзяўчынай, якую апраналі ў святочнае адзенне, на галаву надзявалі папяровы вянок з рознакаляровымі стужкамі, хадзіла па хатах, дзе выконвала *шчадроўкі*—песні, што ўслаўляюць гаспадара, гаспадыню, іх дзяцей і гаспадарку.

Р.К.Шчадрын.

ШЧАДРО́ЎКІ, песні, якія спяваюцца на *шчадраванні*. Блізкія да *калядных песень*.

ШЧАДРЫ́Н, вёска ў Жлобінскім р-не Гомельскай вобл., на аўтадарозе Жлобін—Парычы. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 48 км на З ад г. Жлобін, 131 км ад Гомеля, 18 км ад чыг. ст. Чырвоны Бераг. 781 ж., 302 двары (2003). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Магіла ахвяр фашызму.

Вядома з 18 ст. як вёска ў Бабруйскім пав. Мінскага ваяв. З 1793 у складзе Рас. імперыі. У 1885 у Ш. школа, 3 малітоўныя дамы, 3 крамы. З 1890 сяло ў Стэпскай вол. Бабруйскага пав. У 1897 — 4022 ж., 429 двароў, цагельня, аптэка, заезны дом, 8 яўр. малітоўных дамоў, 50 крам; у сядзібе Ш. — 255 ж., 27 двароў, школа, паштова-тэлегр. аддзяленне, крама, яўр. малітоўны дом. У 1924—30 цэнтр сельсавета ў Парыцкім р-не Бабруйскай акр., з 1938 Палескай вобл.; з 1935 мястэчка, з 1938 зноў вёска. У Вял. Айч. вайну 8.3.1942 ням. фашысты загубілі 1,2 тыс. жыхароў. У 1941—43 дзейнічала *Шчадрынскае камсамольска-маладзёжнае падполле*. З 1954 цэнтр сельсавета ў Парыцкім, з 1961 — у Светлагорскім, з 1962 — у Жлобінскім р-нах Гомельскай вобл. У 1959 — 791 жыхар.

С.В.Марцэлеў.

ШЧАДРЫ́Н Радзівон Канстанцінавіч (н. 16.12.1932, Масква), расійскі кампазітар, піяніст, музычна-грамадскі дзеяч. Нар. арт. СССР (1981). Чл.-кар. Баварскай акадэміі прыгожых мастацтваў (1976). Ганаровы чл. АМ ГДР (1983). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1955; кл. кампазіцыі Ю.А.*Шапорына*, кл. фп. Я.У.*Фліера*). Працуе ў розных жанрах. Узбагаціў выразныя магчымасці музыкі, стварыў новы тып вак.-інстр. твораў, увёў прыёмы нар. манеры спеваў у акад. жанры. Дасягненні ў галіне муз. т-ра звязаны з увасабленнем рус. літ. класікі. Сярод твораў: оперы «Не толькі каханне» (паст. 1961), «Мёртвыя душы» (паст. 1977), балеты «Канёк-гарбунок» (паст. 1960), «Кармэн-сюіта» (паст. 1967, паводле оперы «Кармэн» Ж.Бізэ; у Дзярж. т-ры оперы і балета

Беларусі паст. 1974), «Ганна Карэніна» (паст. 1972), 2 сімфоніі (1958, 1965), «Камерная сюіта» для камернага аркестра (1961; у т-ры оперы і балета Беларусі паст. аднайм. балет, 1974), канцэрты для аркестра, творы для фп., хары, музыка да спектакляў драм. т-ра, кінафільмаў, у т.л. «Нармандыя — Нёман», і інш. Выступае як муз. крытык. Дзярж. прэмія СССР 1972. Ленінская прэмія 1984. Дзярж. прэмія Расіі 1992.

Літ.: Тараканов М. Творчество Родиона Щедрина. М., 1980; Прохорова И. Родион Щедрин: Начало пути. М., 1989.

ШЧАДРЫ́Н Сільвестр Феадосьевіч (13.2.1791, С.-Пецярбург — 8.11.1830), рускі жывапісец; адзін з заснавальнікаў рус. рэаліст. пейзажа. Сын Ф.Ф.*Шчадрына*. Скончыў Пецярбургскую АМ (1811). З 1819 пенсіянер АМ у Італіі. Адзін з першых у еўрап. мастацтве 19 ст. звярнуўся да пленэрнага жывапісу. Пісаў пейзажы, якія вылучаюцца тонкай паэтычнасцю, эмацыянальнай рамант. прыўзнятасцю, імкненнем да светлавых і каларыстычных эфектаў: «Новы Рым. Замак св. Анёла» (1823—28), «Малая гавань у Сарэнта», «На востраве Капры» (абодва 1826), «Веранда, абвітая вінаградам» (1828), «Месячная ноч у Неапалі» (1828—29). *Л.Ф.Салавей.*

Сільвестр **Шчадрын**. Веранда, абвітая вінаградам. 1828.

ШЧАДРЫ́Н Сямён Фёдаравіч (17.4.1745, С.-Пецярбург — 13.9.1804), рускі жывапісец; заснавальнік рус. пейзажнага жывапісу. Брат Ф.Ф.*Шчадрына*. Скончыў Пецярбургскую АМ (1767), з 1776 выкладаў у ёй, з 1779 акад., з 1798 ад'юнкт-рэктар, з 1799 кіраўнік гравіравальна-ландшафтнага класа. Творчасць прасякнута ідэямі сентыменталізму. Яго паркавыя пейзажы вылучаюцца ўмоўнасцю кампазіцыйных прыёмаў і колеравага вырашэння, тонкім пачуццём прыгажосці прыроды, вял. увагай да перадачы асаблівасцей мясцовасці: «Від у ваколіцах Пецярбурга» (1780-я г.), «Від на Гатчынскі палац з Доўгага вострава» (1796), пано «Каменны мост у Гатчыне» (1799—1801). *Л.Ф.Салавей.*

ШЧАДРЫ́Н Феадосій Фёдаравіч (1751, С.-Пецярбург — 31.1.1825), рускі скульптар; адзін з вядучых майстроў рус. класіцызму. Брат С.Ф.*Шчадрына*. Скончыў Пецярбургскую АМ (1773). Пенсіянер АМ у Фларэнцыі і Рыме (з 1773), Парыжы (1775—85). З 1794 выкладчык, з 1818 рэктар Пецярб. АМ. Яго станковым творам уласцівы класічная яснасць вобразаў, вытанчанасць мадэліроўкі: «Эндыміён спіць» (1779), «Венера» (1794). Майстар манум.-дэкар. пластыкі: статуі і групы фантанаў Петрадварца «Персей» (1800), «Нява» (1804), «Сірэны» (1805); барэльеф «Нясенне крыжа» для Казанскага сабора (1807—11); скульпт. ўпрыгожанне Адміралцейства ў С.-Пецярбургу (фігуры на каланадзе цэнтр. вежы, 3 фігуры на атыку, 2 групы «Марскія німфы», 1812—13). Выканаў шэраг партрэтаў, у т.л. М.Паніна (1794), А.Нартава (1811).

Літ.: Петинова Е.Ф. Феодосий Шедрин. Л., 1977.

Сямён **Шчадрын**. Каменны мост у Гатчыне. 1799—1801.

ШЧАДРЫ́НА Валянціна Ніканораўна (н. 28.5.1927, в. Вербавічы Нараўлянскага р-на Гомельскай вобл.), расійская перакладчыца. Засл. работнік культ. Беларусі (1977). Скончыла БДУ (1951). Працавала ў бел. і рас. выд-вах, перыяд. друку, настаўнічала. У 1968—87 у сакратарыяце праўлення Саюза пісьменнікаў СССР, кансультант па бел. л-ры. Друкуецца з 1961. На рус. мову пераклала творы: «Кастры завірухі» Л.Арабей (1970), «Пачакай, затрымайся...» А.Васілевіч (1972), «Халады ў пачатку вясны» (1973) і «Дзень перад святам» (1980) А.Кудраўца, «Белы камень» А.Асіпенкі (1974), «Каласы пад сярпом тваім» (1974, 1979), «Сівая легенда» (1981), «Дзікае паляванне караля Стаха» (1983, 1990) і «Чорны замак Альшанскі» (1984) У.Караткевіча, «Чорныя буслы» Л.Гаўрылкіна, «Порт прызначэння» А.Крыгі, «Найдорф» І.Пташнікава (усе 1977), «Дажынкі» М.Тычыны (1981), «Раніцця сны» М.Гіля, «Адзін дождж на ўсіх» М.Кацюшэнкі, «Рукі на кляновым лісце» Я.Скрыгана (усе 1985), «Стронга» У.Ягоўдзіка (1987), «Белыя брады» Х.Лялько, «У кругаверці дзён» Р.Семашкевіча (абодва 1989), асобныя апавяданні і аповесці В.Быкава, В.Віткі, В.Коўтун, М.Купрэева, У.Рубанава, І.Чыгрынава і інш.

ШЧАДРЫ́НСКАЕ КАМСАМО́ЛЬСКА-МАЛАДЗЁЖНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала ў жн. 1941 — кастр. 1943 на тэр. Жлобінскага р-на з цэнтрам падполля ў в. *Шчадрын*. Налічвала 15 чал. (кіраўнікі Л.М.Жураўлёва, С.Дз.Трызна). У вер. 1942 падпольшчыкі наладзілі сувязь з групай І.А.Крышнёва, што прыбыла з-за лініі фронту і дзейнічала пад кіраўніцтвам Жлобінскага падп. райкома КП(б)Б і камандавання партыз. атрада «Смерць фашызму» брыгады імя П.К.Панамарэнкі. Падпольшчыкі здабывалі партызанам звесткі разведкі, збіралі і перадавалі зброю, боепрыпасы, харч. прадукты, учынялі дыверсіі (падарвалі будынак ням. камендатуры, рэгулярна мініравалі прасёлачныя дарогі і інш.). У ліку членаў падполля быў Герой Сав. Саюза С.П.*Анішчанка*.

М.Ф.Шумейка.

ШЧАДРЭ́ЦЬ, багатая куцця, у беларусаў і інш. славянскіх народаў стараж. звычай адзначаць святочны вечар напярэдадні Новага года. Вызначаўся багаццем абрадавых страў, з якімі ў старажытнасці звязвалі надзею на дабрабыт і здароўе сям'і. У беларусаў абавязковымі стравамі былі бліны з верашчакай і смажанай каўбасой, скваркамі, куцця, крупнік з мясам, боршч (буракі). На Ш. звычайна варажылі пра будучы ўраджай, дзяўчаты — пра замужжа. Са Ш. звязаны звычай *шчадравання*.

«ШЧАДРЭ́ЦЦ», калядная гульня ў беларусаў, што ўяўляла сабой тэатралізаваную сцэнку з музыкай, спевамі, танцамі, дыялогам. Бытавала як святочная забава напярэдадні Новага года. Упершыню яе зафіксаваў і апісаў у «Могилевских губернских ведомостях» (1952, №52, неафіц. ч.) Н.Гашкевіч. Мае шмат агульнага з калядными гульнямі *«Каза»*, *«Кабыла»*, *«Мядзведзь»*. Галоўным у гульні быў «Шчадрэц» — малады хлопец, апрануты старым (з маскай на твары, гарбом на спіне, у вопратцы, увешанай званочкамі, каляровым рыззём і г.д.) ці салдатам (жаўнерам) у адпаведным адзенні. Ён хадзіў разам з пераапранутымі ў жывёлы і хлопцамі-шчадраванцамі (іх карагод складаўся з важатага, музыкантаў, прыпявалаў, запявалаў, забіралаў). Вечарам, напярэдадні Новага года, гурт адпраўляўся шчадраваць. Важаты заходзіў у хату да гаспадара за дазволам пашчадраваць, а гурт у той час спяваў пад вокнамі. Атрымаўшы згоду, шчадраванцы ўваходзілі ў хату. Пад музыку на сярэдзіну хаты выходзілі шчадраванцы з пераапранутымі ў жывёлы і танцавалі, а запявалы і прыпявалы спявалі. Разыгрываліся гумарыстычныя сцэнкі, адбываўся жартоўны дыялог паміж «Шчадрацом», шчадраванцамі і гледачамі. Пасля завяршэння гульні яе ўдзельнікаў частавалі, частку пачастункаў клалі ў торбы забіралам. *Дз.У.Стэльмах.*

ШЧАКАЦІ́ХІН Мікалай Мікалаевіч (13.10.1896, Масква — 5.4.1940), бел. мастацтвазнавец, педагог; адзін з заснавальнікаў бел. мастацтвазнаўства. Вучыўся ў Маскоўскім ун-це (1914—18). З 1918 інструктар аддзела Наркамасветы па справах музеяў і аховы помнікаў мастацтва і даўніны ў Маскве, з 1919 лектар пры палітаддзеле Арлоўскай ваен. акругі. З 1920 у Харкаве, навук. супрацоўнік музея, заг. перакладчыцкай камісіі пры навук.-тэарэт. аддз. Наркамасветы Украіны, чл. праўлення Усеўкр. саюза пісьменнікаў. З 1921 у Мінску. З 1922 асістэнт кафедры гісторыі мастацтваў БДУ, з 1923 выкладаў у ім курс па гісторыі бел. мастацтва. Адначасова з 1925 у Інбелкульце: навук. сакратар секцыі бел. мастацтва, з 1926 чл.-супрацоўнік камісіі па гісторыі мастацтваў і стыль-рэдактар выдавецкага аддзела, з 1927 навук. сакратар па вывучэнні мастацтва Беларусі, старшыня камісіі гісторыі мастацтваў (у 1929—30 у БелАН). 18.7.1930 арыштаваны, сасланы ў г. Белебей (Башкортастан). Рэабілітаваны ў 1956. Даследаваў бел. архітэктуру 11—19 ст., манум. жывапіс полацкіх храмаў, іканапіс 17—18 ст., стараж.-бел. гравюры, мастацтва кніг Ф.Скарыны і інш. Вывучаў творчасць мастакоў І.Ахрэмчыка, В.Волкава, А.Грубэ, У.Кудрэвіча, М.Філіповіча і інш. Выпрацаваў навук. канцэпцыю гісторыі бел. мастацтва, асн. кірункі яго развіцця і перыядызацыі. Увёў ва ўжытак паняцці «беларускае адраджэнне», «беларускае барока» і «беларуская готыка». Адзін з арганізатараў 1-й Усебел. маст. выстаўкі (1926) і стваральнікаў музейных збораў на Беларусі. У канцы 1920-х г. даследаваў вадзяныя знакі Метрыкі ВКЛ, манеты ВКЛ 16—17 ст. Аўтар прац «Фелікс Валатон» (1918?), «Васіль Вашчанка — магілёўскі гравёр канца XVII — пачатку XVIII ст.» (1925), «Гравюры і кніжныя аздобы ў выданнях Францішка Скарыны» (1926), «Беларуская архітэктура ў XI—XII ст.» (1927), «Да пытання аб храналогіі «Малой падарожнай кніжыцы» Скарыны» (1928), «Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва» (т. 1, 1928), «Тапаграфія кладаў з літоўскімі манетамі на тэрыторыі старажытнай Літоўскай дзяржавы», «Некаторыя варыянты літоўскіх манет», «Нарыс гісторыі літоўскай манеты XVI—XVII стагоддзяў» (усе 1930-я г.; у рукапісе). Разам з В.Ластоўскім апрацаваў паказальнік «Сучаснае беларускае мастацтва: Праваднік па аддзеле сучаснага беларускага малярства і разьбярства» (1929). Аўтар артыкула «Беларускае мастацтва» для 1-га выд. Вял. Сав. Энцыклапедыі (т. 5, 1927).

Тв.: Иллюстрации Даниеля Ходовецкого к «Буре» Шекспира // Працы БДУ. 1923. №4—5; 1926. №12; Фрэскі Полацкага Барысаглебскага манастыра // Наш край. 1925. №1; Матывы краязнаўства ў нашым сучасным мастацтве: (З вынікаў Усебел. выстаўкі) // Там жа. 1926. №2—3; Замак у Рагачове // Там жа. №10—11; Матэрыялы да гісторыі беларускага малярства XVIII стагоддзя // Віцебшчына. Віцебск, 1925—28. Т. 1—2; Калі радзіўся Францішак Скарына // Полымя. 1925. №5; Сучаснае мастацтва Беларусі // Там жа. 1926. №6; Кнігапіс // Там жа. №7; На шляхах да новага беларускага мастацтва: (Нарыс творчасці Міхася Філіповіча) // Там жа. 1927. №2; Беларускае мастацтва ў гістарычнай і археалагічнай літаратуры // Там жа. №6, 8; Помнікі старадаўняй архітэктуры XVII—XVIII стагоддзяў у Мінску // Зап. Аддз. гуманіт. навук. Мн., 1928. Кн. 6. Працы камісіі гісторыі мастацтва, т. 1; Рыгор Мядзведзкі — невядомы беларускі маляр канца XVIII стагоддзя // Там жа.

Літ.: Ліс А. Мікола Шчакаціхін: Харастно няпазнанай зямлі. Мн., 1968; Яго ж. Мікола Шчакаціхін // Ліс А. Цяжкая дарога свабоды. Мн., 1994; Матэрыялы: Да 100-годдзя з дня нараджэння Міколы Шчакаціхіна, 1896—1940. Мн., 1996; Чэбан І. Уплыў даследаванняў М.Шчакаціхіна на развіццё сучаснага мастацтвазнаўства // Беларускае сучаснае мастацтвазнаўства і крытыка. Мн., 1998; Яе ж. Праблемы скарынаznаўства ў мастацтвазнаўчай спадчыне М.Шчакаціхіна // На шляху да сталасці: Стан і перспектывы развіцця бел. мастац. крытыкі. Мн., 2001.

І.Л.Чэбан.

М.М.**Шчакаціхін**.

Л.Дз.**Шчамялёў**.

ШЧАМЯЛЁЎ Анатоль Мяфодзьевіч (н. 13.12.1940, в. Некрашова Сенненскага р-на Віцебскай вобл.), бел. вучоны ў галіне машынабудавання. Канд. тэхн. н. (1971), праф. (1996). Скончыў БПІ (1962). З 1962 у Магілёўскім тэхн. ун-це (у 1976—80 дэкан ф-та, у 1985—96 заг. кафедры, у 1998—2002 нач. вучэбна-метадычнага ўпраўлення). Навук. працы па распрацоўцы сістэм энергазберажэння гідрафікаваных мабільных машын, зніжэнні металаёмістасці машын, стварэнні роўнатрывалых канструкцый машын.

Тв.: Дорожно-строительные машины. Мн., 2000 (у сааўт.); Строительные машины и средства малой механизации. 2 изд. Мн., 2002 (разам з С.Б.Партновым, Л.І.Белавусавым).

ШЧАМЯЛЁЎ Леанід Дзмітрыевіч (н. 5.2.1923, г. Віцебск), бел. жывапісец. Нар. маст. Беларусі (1983). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1959). З 1959 выкладаў у Мінскім маст. вучылішчы, у 1968—74 у Рэсп. школе-інтэрнаце па музыцы і выяўл. мастацтве. Працуе ў розных жанрах станковага жывапісу. Тэма гераізму народа ў Вял. Айч. вайне ўвасоблена ў палотнах «Цяжкія гады» (1965), «Маё нараджэнне» (1967), «Палявы трыбунал» (1974—75), «Генерал

Л.**Шчамялёў**. Беларусы ў Вене. 1998.

Даватар» (1975), «3 ліпеня» (1977), «Першы дзень міру» (1981), «Люты 1942», «Светлая память» (абодва 1984), «Ідзе вайна народная» (1985). Шматграннасць і маштабнасць асобы выяўлены ў карцінах «1918 год. Ленін і Дзяржынскі» (1969), «Кастусь Каліноўскі» (1975), «Вяртанне. Мікола Гусоўскі», «Рэпін у Здраўнёве» (абедзве 1980), «Народны паэт Беларусі Я.Купала» (1981), «Леся Украінка» (1983). Лірыка-эпічнае гучанне вылучае цыклы палотнаў «Край мой Міншчына», «Ільны івянецкія» (абодва 1977), «Навала 22 чэрвеня 1941 года», «Ліставей», «Лета» (усе 1978). Псіхал. глыбіня, шчырасць характарыстык уласцівы творам пра сучаснікаў: «Настаўніца» (1969), партрэты мастакоў М.Чэпіка (1970), Г.Вашчанкі (1980), В.Цвіркі (1982), «Каця малюе» (1985), «Алена Малочка» (1990), «Партрэт у інтэр'еры» (1995), «Святар» (2002) і інш. Выразныя і маляўніча-пластычныя краявіды: «Асенні кліч» (1975), «Вязынка» (1976), «Сосны», «Студзень у Мінску» (абодва 1977), «Крыніца», «У канцы студзеня», «Напрадвесні», «Лошыца» (усе 1978), «Вясна на Дзвіне» (1979), «Радзіма» (1981), «Зіма ў Ракаве» (1982); серыі «Новае поле» (1979—82), «Лета ў Астрашыцкім» (1994), «Як быццам у сне», «Караван», «Цёплае лета» (усе 1995), «Снежань», «Сакавік», «Майскі вечар», «Зіма ў Пінску» (усе 1996), «Беларусы ў Вене» (1998). Аўтар нацюрмортаў «Цюльпаны» (1973), «Мёд» (1974), «Пасля канцэрта» (1975), «Крэсла бацькі», «Кветкі зямлі» (абодва 1978), «Вязынка. У хаце паэта» (1982), «Учора і сёння» (1986), «Памяці 1794» (1993), «Восень» (1995), «Мой свет» (1996). Яго творы вылучаюцца свабоднай пластычнай манерай выканання з выкарыстаннем гучнага колеру і святлоценявых дынамічных эфектаў, адсутнасцю дэталізацыі, экспрэсіўнасцю. Іл. гл. таксама да арт. *Жывапіс*.

Літ.: Л.Д.Щемелев: Цвета времени. М., 1978; Крэпак Б.А. Леанід Шчамялёў. Мн., 1981; Л.Дз.Шчамялёў: [Альбом]. Мн., 1997; Леанід Шчамялёў: Нар. мастак Рэспублікі Беларусь: [Альбом]. Мн., 1998. *Л.Ф.Салавей.*

ШЧАМЯЛІ́ЦА, род кветкавых раслін; тое, што *медуніца*.

ШЧА́ПАЎ Афанасій Пракопавіч (17.10.1831, с. Анга Качугскага р-на Іркуцкай вобл., Расія — 10.3.1876), расійскі гісторык, публіцыст. Праф. (1860). Скончыў Казанскую духоўную акадэмію (1856), выкладаў рус. гісторыю ў ёй (1856—60), потым у Казанскім ун-це (1860—61). У пач. 1860-х г. супрацоўнічаў у час. «Отечественные записки», «Русское слово», «Время», «Век». Западозраны ў сувязях з А.І.*Герцэнам* і М.П.*Агаровым*, у 1864 высланы ў Сібір, жыў на радзіме, потым у Іркуцку. Даследаваў пераважна гісторыю рус. сектанцтва і *расколу*, якія разглядаў як праяву нар. пратэсту супраць сац. прыгнёту. Асн. праца — «Рускі раскол старабрадства, які разглядаецца ў сувязі з унутраным станам рускай царквы і грамадзянскасці ў XVII ст. і першай пал. XVIII» (1859).

Тв.: Соч. Т. 1—3. СПб., 1906—08.
Літ.: Семенов В.Ф. А.П.Щапов. Казань, 1983.

ШЧА́РА, рака ў Брэсцкай і Гродзенскай абл., левы прыток р. Нёман. Даўж. 325 км. Пл. вадазбору 6990 км^2. Пачынаецца на Навагрудскім узвышшы з воз. Калдычэўскае ў Баранавіцкім р-не Брэсцкай вобл., упадае ў Нёман за 2 км на ПдУ ад в. Дашкаўцы Мастоўскага р-на Гродзенскай вобл. Асн. прытокі: Ліпнянка, Мышанка, Лахазва, Уса, Пад'яварка (справа), Ведзьма, Грыўда, Луконіца, Сіпа (злева). Вадазбор у межах Прыпяцкага Палесся, Баранавіцкай раўніны, паўд.-зах. схілаў Навагрудскага ўзв. і Верхнянёманскай нізіны. Паводле будовы даліны, рэчышча і ўмоў працякання Ш. падзяляецца на 2 участкі. Ад вытоку да ўпадзення р. Грыўда даліна трапецападобная (шыр. 1,5 км), са стромкімі схіламі выш. 15—20 м, пойма нізкая, забалочаная і куп'істая, перарэзана асушальнымі каналамі. Шыр. разліву ад 200—300 м да 2—3 км. Ад вуся Агінскага канала пойма парэзана сеткай каналаў, па якіх (і па Агінскім канале) у веснавое разводдзе адбываецца пераліў вады са Шчары ў воз. Выганашчанскае. Рэчышча звілістае, акрамя каналізаваных участкаў у вытоку і перад упадзеннем р. Грыўда; яго шыр. 15—30 м, месцамі да 60 м. Берагі нізкія, пераважна тарфяністыя. На ўчастку ад упадзення р. Грыўда да вуся даліна трапецападобная, шыр. 3—5 км. Схілы стромкія, выш. 10—20 м, месцамі 35—40 м, у ніжнім цячэнні спадзістыя. Пойма забалочаная, яе шыр. ў пачатку ўчастка 1,5—2 км, у сярэдняй частцы 500—800 м, у ніжняй 50—300 м. Рэчышча звілістае. Веснавое разводдзе пачынаецца ў пачатку сак. і доўжыцца ў сярэднім 65—80 сут; ускладняецца нераўнамернасцю снегараставання і выпадзеннем дажджоў. Сярэдняе перавышэнне найвыш. ўзроўню над летне-асенняй межанню 1,8 м. Замярзае ў канцы снеж. (найб. таўшчыня лёду 40—65 см), крыгалом у сярэдзіне сакавіка. Сярэднегадавы расход вады ў вусці 37,7 м^3/с. Суднаходная ад в. Быцень (за 155 км ад вуся) у паўнаводны перыяд. На рацэ *Даманаўскае вадасховішча* (у сутоках з р. Грыўда) і *Чамялынскае вадасховішча*, г. Слонім. Рака выкарыстоўваецца як водапрыёмнік меліярац. сістэмы. У маляўнічай мясціне ўздоўж ракі на Пд ад г. Ляхавічы зона адпачынку Шчара.

Рака **Шчара** ніжэй Слоніма.

ШЧАРБАКО́ВА Таісія Аляксееўна (н. 10.12.1932, г. Марыупаль Данецкай вобл., Украіна), бел. музыказнавец, педагог. Д-р мастацтвазнаўства (1989), праф. (1990). Засл. работнік вышэйшай школы Беларусі (1983). Скончыла Горкаўскую кансерваторыю (1959). У 1952—60 выкладала ў горкаўскіх дзіцячай муз. школе, кансерваторыі, лектар філармоніі. З 1962 выкладчык Бел. акадэміі музыкі (з 1990 заг. кафедры). Навук. працы па пытаннях гісторыі рас. музыкі, бел. муз. культуры. Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай савецкай музыкі» (1971), «Гісторыі беларускай музыкі» (1976). Аўтар тэле- і радыёперадач.

Тв.: Споры и искания: Из истории «Бориса Годунова» М.Мусоргского. Мн., 1971; Цыганское музыкальное исполнительство и творчество в России. М., 1984; Михаил и Матвей Виельгорские: Исполнители. Просветители. Меценаты. М., 1990; «Жизнь, где бы ни сказалась...» // Муз. академия. 1999. №2; «Жизнь за царя»: черты священнодействия // Там жа. 2000. №4; Из истории русской музыкальной текстологии. Мн., 2001; Оперный эпос в России XIX в.: Истоки и стимулы развития // Вопросы истории музыки. Мн., 2002. *Дз.М.Жураўлёў.*

ШЧАРБАКО́Ў Васіль Васілевіч (н. 20.4.1951, в. Казімірова Полацкага р-на Віцебскай вобл.), Герой Сав. Саюза (1980). Скончыў Сызранскае вышэйшае ваен. авіявучылішча лётчыкаў (1972), Ваенна-паветр. акадэмію (1984). У Сав.

Арміі з 1970. Камандзір эскадрыллі маёр Ш. вызначыўся ў вайне ў Афганістане 1979—89, калі ў час бою з душманамі ў 1979 быў збіты сав. верталёт, Ш. падабраў яго экіпаж і на сваёй падбітай машыне вывез з поля бою. Да 1996 у ВВС Расіі.

Літ.: Каршакевич Д. Герой нашего времени // Армия. 1999. №6.

В.К.**Шчарбакоў**.

Г.Б.**Шчарбакоў**.

ШЧАРБАКО́Ў Васіль Карпавіч (27.2.1898, в. Дубраўка Аршанскага р-на Віцебскай вобл. — 29.6.1938), бел. гісторык, грамадскі дзеяч. Акад. АН Беларусі (1931), д-р гіст. н. (1934). Скончыў Рагачоўскую настаўніцкую семінарыю (1918), Харкаўскую вышэйшую парт. школу (1923). Удзельнік падп. барацьбы супраць ням. акупантаў у Рагачове (1918), грамадз. вайны на Усх. і Паўд. франтах. У 1920 нач. аддзела палітасветы дывізіі ў Крыме. З 1923 рэктар Ін-та нар. адукацыі ў Чарнігаве. У 1930 заг. сектара навукі і асветы ЦК КП(б)Б. У 1931—35 віцэ-прэзідэнт, у 1935—37 неадменны сакратар АН Беларусі, адначасова ў 1931—37 нам. дырэктара, дырэктар Ін-та гісторыі АН Беларусі, у 1931—34 праф. у Вышэйшай камуніст. с.-г. школе Беларусі, Мінскім пед. ін-це, БДУ. Першы дэкан гіст. ф-та БДУ (адкрыты ў 1934). У жн. 1936 выключаны з КП(б)Б. 21.7.1937 беспадстаўна арыштаваны, у чэрв. 1938 прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1957. Аўтар навук. прац па гісторыі сял. руху ў перыяд феадалізму, гісторыі Кастр. рэвалюцыі і грамадз. вайны на Беларусі, гістарыяграфіі і інш. Адзін з першых сав. даследчыкаў паспрабаваў у абагульняльнай працы «Нарыс гісторыі Беларусі» (ч. 1, 1934; 2-я частка затрымана ў друку) раскрыць з марксісцкіх пазіцый гісторыю Беларусі са стараж. часоў да 18 ст. На будынку Ін-та гісторыі АН Беларусі яму ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Тв.: Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі і белапольская акупацыя. Мн., 1930; Пытанні культуры і асветы на XIII з'ездзе КП(б)Б. Мн., 1931; Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі. Мн., 1934; Сялянскі рух і казацтва на Беларусі ў эпоху феадалізму. Мн., 1935; Крестьянское движение в Белоруссии XVI и XVII вв. // Ист. сб. 1935. №4.

У.М.Міхнюк.

ШЧАРБАКО́Ў Георгій Барысавіч (22.8.1917, Масква — 9.6.1989), бел. рэжысёр, акцёр, педагог. Нар. арт. Беларусі (1963). Праф. (1977). Скончыў Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва (1939). Працаваў у т-рах Масквы, Вільнюса і інш. У 1966—89 выкладаў у Маскоўскім ін-це культуры. З 1958 гал. рэжысёр Бел. т-ра імя Я.Коласа, у 1962—64 — Бел. т-ра імя Я.Купалы. Яго рэжысуры ўласціва спалучэнне наватарскіх пошукаў з нац. традыцыямі сцэн. мастацтва, выразнае пастановачна-відовішчнае ўвасабленне задумы. Паставіў спектаклі: у т-ры імя Я.Коласа — «Пачатак жыцця» К.Фіна, «Навальніца будзе» паводле трылогіі Я.Коласа «На ростанях» (абодва 1958), «Бітва ў дарозе» паводле Г.Нікалаевай (1959), «Іркуцкая гісторыя» А.Арбузава, «Лявоніха» П.Данілава (абодва 1960), «Крыніцы» паводле І.Шамякіна (1961), «Вайна пад стрэхамі» паводле А.Адамовіча (1967); у т-ры імя Я.Купалы — «Першая старонка» Н.Івантар, «Сябры і гады» Л.Зорына, «Рускія людзі» К.Сіманава (усе 1963), «Канец — справе вянец» У.Шэкспіра (1964), «Працяг» Д.Валеева (1973).

Літ.: Халип В. Строка, прочтенная театром. Мн., 1973.

Б.І.Бур'ян.

ШЧАРБАКО́Ў Дзмітрый Іванавіч (13.1.1893, г. Навазыбкаў Бранскай вобл., Расія — 25.5.1966), расійскі геолаг і геахімік. Акад. АН СССР (1953, чл.-кар. 1946). Вучань У.І.*Вярнадскага* і А.Я.*Ферсмана*. Скончыў Крымскі ун-т (1922). З 1922 ва ўстановах АН СССР, з 1953 акадэмік — сакратар Аддз. геолага-геагр. навук АН СССР, з 1964 заг. аддзела геахіміі Ін-та геалогіі рудных радовішчаў, петраграфіі, мінералогіі і геахіміі АН СССР. Удзельнік навук. экспедыцый на Памір, у Таджыкістан, Забайкалле і інш. Асн. працы па геалогіі і геахіміі радовішчаў рэдкіх металаў і радыеактыўных элементаў, па акіяналогіі і гісторыі геал. навук. Яго імем наз. мінерал — шчарбакавіт. Ленінская прэмія 1965.

Тв.: Избр. труды. Т. 1—3. М., 1969—71.

Літ.: Д.И.Щербаков: Жизнь и деятельность, 1893—1966. М., 1969.

ШЧАРБАКО́Ў Сяргей Васілевіч (н. 25.4.1934, с. Белаводскае Чуйскай вобл., Кыргызстан), бел. вучоны ў галіне матэрыялазнаўства і машынабудавання. Д-р тэхн. н. (1983), праф. (1988). Акад. Бел. інж. акадэміі (1995). Скончыў Бел. ін-т інжынераў чыг. транспарту (1958), дзе і працаваў. З 1961 у Ін-це механікі металапалімерных сістэм АН Беларусі (з 1965 заг. лабараторыі, з 1970 нам. дырэктара і адначасова нач. СКБ з доследнай вытв-сцю). З 1986 у Бел. ун-це транспарту (у 1986—2001 прарэктар, у 1994—2001 адначасова рэктар Ін-та павышэння кваліфікацыі пры ун-це). Навук. працы па тэхналогіі і канструяванні маш.-буд. вырабаў на аснове металаў і палімераў. Дзярж. прэмія Беларусі 1972.

Тв.: Зубчатые передачи из пластмасс. Мн., 1965 (разам з У.А.Белым, А.І.Свірыдзёнкам); Металлополимерные материалы и изделия. М., 1979 (у сааўт.); Металлополимерные зубчатые передачи. Мн., 1981 (разам з У.А.Белым, В.Я.Старжынскім).

ШЧАРБАКО́Ў Уладзімір Аляксеевіч (н. 5.1.1939, в. Шчарбачы Крычаўскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне раслінаводства. Канд. біял. н. (1969). Чл.-кар. Агр. АН Беларусі (1992). Скончыў Бел. тэхнал. ін-т (1962). З 1968 у Ін-це эксперым. батанікі. З 1972 вучоны сакратар Зах. аддз., з 1991 — Бел. аддз. УАСГНІЛ; у 1992—97 гал. вучоны сакратар, у 2001—02 нач. аддзела агр. АН Беларусі. Навук. працы па фізіялогіі і біяхіміі росту і развіцця раслін, вырошчванні асн. с.-г. культур і інш.

Тв.: Кукуруза. 2 изд. Мн., 1999 (у сааўт.); Рапс. Мн., 1999 (у сааўт.); Зерновые культуры. 2 изд. Мн., 2000 (у сааўт.); Экологическое состояние почв Беларуси (разам з І.М.Багдзевічам, М.І.Смяянам) // Междунар. агр. журн. 2000. №5.

ШЧАРБА́ТАЎ Аляксандр Рыгоравіч (1854 — 24.4.1915), расійскі вучоны-эканаміст. Скончыў Маскоўскі ун-т. У 1892—1904 прэзідэнт Маскоўскага т-ва сельскай гаспадаркі. У сваіх працах разарэнне сял. гаспадарак Расіі тлумачыў іх агратэхн. адсталасцю; абшчыннае землеўладанне разглядаў як гал. апору рас. дзярж. ладу і самабытны інстытут, прыстасаваны да ўмоў і розных відаў нар. жыцця, як сродак выратавання краіны ад рэвалюцыі і сацыялізму («Упарадкаванне абшчыннага сялянскага землеўладання», 1902). Адзін з арганізатараў 1-га каап. з'езда Расіі, стварэння Маскоўскага нар. банка. Як практык залатога *манаметалізму* выступаў супраць грашовай рэформы 1895—97, адстойваў папярова-грашовую сістэму з уласцівай ёй інфляцыяй («Пераўтварэнне дзяржаўнай грашовай гаспадаркі», 1906). Аўтар прац «Абноўленая Расія» (1908), «Дзяржаўна-народная гаспадарка Расіі ў найбліжэйшай будучыні» (1910) і інш.

ШЧАРБА́ТАЎ Георгій Міхайлавіч (7.5.1919, в. Рэкта Горацкага р-на Магілёўскай вобл. — 2.2.1957), бел. пісьменнік. Скончыў Магілёўскае пед. вучылішча (1938). Настаўнічаў, працаваў у газ. «Камунар Магілёўшчыны», «Советская Белоруссия». У Вял. Айч. вайну з 1942 у тыле ворага, карэспандэнт газ. «Савецкая Беларусь». З 1943 у газ. «Звязда», «Известия» па Беларусі, заг. аддзела, нам. гал. рэдактара час. «Маладосць». Друкаваўся з 1939. Яго творы прысвечаны партыз. барацьбе ў Вял. Айч. вайну. Аўтар запісак «Партызанскія агні» (1950), аповесцей «Ёсць на свеце Масква» (1955), «Шумелі пушчы» (1957), нарысаў «Камсамол Беларусі ў баях за Радзіму» (1950), «Неспакойныя сэрцы» (1951), апавяданняў і інш. На бел. мову пераклаў «Слова перад пакараннем смерцю» Ю.Фучыка.

Тв.: Лясны фронт. Мн., 1961.

ШЧАРБА́ТАЎ Міхаіл Міхайлавіч (22.7.1733 — 12.12.1790), расійскі грамадскі і дзярж. дзеяч, гісторык, публіцыст, ідэолаг карпаратыўных імкненняў дваранства. Князь. Ганаровы чл. Пецярб. АН (1776). Атрымаў рознабаковую хатнюю адукацыю. Да 1762 на ваен., з 1762 на цывільнай службе. У 1760-я г. працаваў у Камісіі па складанні новага Улажэння. Напісаў шэраг артыкулаў, у якіх крытыкаваў палітыку ўрада. Аўтар твораў «Пра псаванне нораваў у Расіі» (выд. 1858), «Падарожжа ў зямлю Афірскую» (выд. 1896), «Гісторыя Расійская ад старажытных часоў» (т. 1—7, выд. 1901—04).

Літ.: Федосов И.А. Из истории русской общественной мысли XVIII ст.: М.М.Щербатов. М., 1967.

ШЧАРБІ́НА Ада Эмануілаўна (н. 31.8.1932, г. Магілёў), бел. вучоны ў галіне хіміі і тэрмадынамікі растворaў неэлектралітаў. Д-р хім. н. (1987), праф. (1988). Скончыла Маскоўскі ін-т нафты і газу імя І.М.Губкіна (1956). З 1966 у Бел. тэхнал. ун-це. Навук. працы па тэрмадынаміцы і фізікахіміі працэсаў раздзялення складаных вуглевадародных сумесей. Распрацавала перспектыўны навук. кірунак — тэрмадынамічныя прынцыпы выбару і выкарыстання змешаных растваральнікаў, укараніла на нафтаперапр. з-дах тэхналогію раздзялення і ачышчэння каталізатараў рыформінгу і масляных дыстылятараў.

Тв.: Хроматографическое изучение межмолекулярных взаимодействий в системах углеводороды — растворители (разам з Р.М.Далінскай) // Прикладная хроматография. Нижний Новгород, 1990; Органическая химия: Реакционная способность основных классов органич. соединений. Мн., 2000 (у сааўт.). *Я.Г.Міляшкевіч.*

ШЧАРБІ́НА Валянцін Мікалаевіч (6.2.1908, г. Харкаў, Украіна — 19.5.1976), бел. геолаг і геахімік. Чл.-кар. АН Беларусі (1956), д-р геолага-мінералаг. н., праф. (1953). Скончыў Харкаўскі ун-т (1933). З 1934 у геал. арг-цыях на Украіне, у Казахстане, Літве, Кіргізіі. У 1955—64 заг. сектара геалогіі і геахіміі мінер. солей Ін-та геал. навук АН Беларусі. Даследаваў Прыпяцкі саляны басейн і Старобінскае радовішча калійных і каменнай солей, асаблівасці саставу і будовы саляносных адкладаў і калійных гарызонтаў, умовы іх утварэння, мінералогію і петраграфію галагенных парод і саляных глін.

Тв.: Строение соляной толщи Старобинского месторождения калийных солей // Изв. вузов. Сер. Геология и разведка. 1960. №11; Геохимический профиль коры выветривания соленосной толщи Старобинского месторождения калийных солей // Материалы семинара по геохимии гипергенеза и коры выветривания. Мн., 1969; Вертикальная геохимическая зональность коры выветривания соленосной толщи Старобинского месторождения калийных солей // Докл. АН БССР. 1970. Т. 14, №10.

ШЧАРБІ́НА Васіль Васілевіч (9.4.1914, г. Горлаўка Данецкай вобл., Украіна — 3.9.1942), удзельнік партыз. руху на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў Адэскае ваен. пях. вучылішча (1938), спецшколу Генштаба РСЧА (1941). У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 камандзір дыверсійнай групы ў тыле ворага ў раёне Лепеля, з сак. 1942 — разведвальна-дыверсійнага атрада, які дзейнічаў у раёне Полацк—Маладзечна—Мінск. За час дзейнасці правёў 19 дыверсій на чыгункі, знішчыў 11 мастоў, 23 км сувязі, 23 аўтамашыны, самалёт праціўніка. Маёр Ш. загінуў у час падрыву чыг. эшалона праціўніка. У г. Валожын яму пастаўлены помнік.

ШЧАРБІ́НА Яўген Іванавіч (н. 12.10.1930, г. Краснадар, Расія), бел. вучоны ў галіне нафтахім. сінтэзу. Д-р тэхн. н. (1979), праф. (1980). Скончыў Азерб. індустр. ін-т у Баку (1954). З 1965 у Бел. тэхнал. ун-це (у 1969—95 заг. кафедры). Навук. працы ў галіне фізікахіміі палімерных кампазіцый, тэорыі і практыкі экстракцыйнага раздзялення шматкампанентных вуглевадародных сістэм. Распрацаваў тэхналогію атрымання новых кампазіцыйных матэрыялаў на аснове эластамераў і пластыкаў, якія выкарыстоўваюцца ў машынабудаванні ў якасці камплектавальных вырабаў.

Тв.: Новые возможности в производстве защитных деталей для автомобилестроения (разам з Р.М.Далінскай) // Вопр. химии и хим. технологии. 2002. №5; Вторичное использование резины. Мн., 2001 (разам з С.С.Мігаль); Структура и свойства резин. Мн., 2003—04. *Я.Г.Міляшкевіч.*

ШЧАРБО́ВІЧ Іосіф Антонавіч (8.11.1902, в. Малая Альшанка Слуцкага р-на Мінскай вобл. — 5.4.1952), бел. вучоны ў галіне гельмінталогіі. Д-р вет. н. (1942), праф. (1946). Скончыў Віцебскі вет. ін-т (1928). У 1931—41 і 1944—52 заг. кафедры Віцебскага вет. ін-та. Распрацаваў метады прыжыццёвай капралагічнай дыягностыкі метастрангілёзу і макракантарынхозу свіней.

ШЧАРЧО́ВА, вёска ў Пружанскім р-не Брэсцкай вобл., каля аўтадарогі Пружаны—Высокае. Цэнтр сельсавета. За 28 км на ПдЗ ад г. Пружаны, 66 км ад Брэста, 14 км ад чыг. ст. Тэўлі. 486 ж., 165 двароў (2003). Сярэдняя школа-сад, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

ШЧАРЫ́ЦА Валерый Пятровіч (н. 16.3.1947, г. Уладзівасток, Расія), бел. трубач. Засл. арт. Беларусі (1990). Скончыў Мінскі ін-т культуры (1986). З 1967 артыст Ансамбля песні і танца Унутр. войск МУС Украіны, з 1970 — Дзярж. эстр. аркестра Арменіі. З 1977 артыст ансамбля «Тоніка» пад муз. кіраўніцтвам А.Эскіна ў канцэртна-гастрольным аб'яднанні «Мінск-канцэрт» пры Бел. філармоніі, з 1980 — аркестра Мінскага цырка, з 1987 — Дзярж. аркестра сімф. і эстр. музыкі Беларусі пад кіраўніцтвам М.Фінберга.

ШЧА́СНАЯ Лада Сяргееўна (н. 5.9.1965, Мінск), бел. мастак. Дачка Н.І.*Шчаснай*. Скончыла Бел. тэатр.-маст. ін-т (1989). З 1993 выкладае ў Бел. ун-це культуры. Працуе ў манум.-дэкар. мастацтве, станковым жывапісе і кніжнай графіцы. Сярод твораў размалёўкі: «Народныя святы» ў Ін-це праблем культуры (1988), «Тэатральныя казкі» ў Бел. т-ры юнага гледача (з Р.Вашкевічам), «Крылы юнацтва», «Чароўныя казкі» ў школе-інтэрнаце №10 (усе 1989) у Мінску, «Памяць казак» у дзіцячым аддз. анкалагічнай бальніцы ў пас. Лясны Мінскага р-на (1991—92). Аўтар жывапісных кампазіцый «Партрэт сябра» (1990), «Разам з кім?» (1991), «Папялушка» (1992), «Ахоўнікі» (1993), «Вечар» (1996), «Сонца яшчэ не зайшло (Аўтапартрэт)» (1997), «У чаканні цябе», «Змрок» (абедзве 2002), «Перачытваючы Оскара Уайльда» (2003), ілюстрацый да кніг. Творчасці ўласцівы тонкае адчуванне прыгажосці прыроды і чалавека, яркая маляўнічасць жывапісных вырашэнняў. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1990. *Л.Ф.Салавей.*

ШЧА́СНАЯ Нінэль Іванаўна (н. 25.10.1933, г. Полацк Віцебскай вобл.), бел. мастак. Засл. дз. маст. Беларусі (1989). Скончыла Мінскае маст. вучылішча (1955), Ін-т жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І.Рэпіна ў Ленінградзе (1961). Працуе ў станковым жывапісе, кніжнай і станковай графіцы, манум.-дэкар. мастацтве. Аўтар сюжэтна-тэматычных карцін «Вясёлка», «Пад сонейкам» (абедзве 1966), «Пяць пакаленняў (Лазня)» (1967), «Самотная» (1968), «Васількі» (1972), «Налібоцкая пушча» (1975), «Пасля змены», «Лада слухае» (абедзве 1978), «Спрадвечнае» (1980), «Маё нараджэнне» (1981), «Толькі яго нявеста» (1984), «Белыя крылы», «Гуканне вясны ў Заслаўі» (абедзве 1987), «Мая сям'я» (1997), «Сястра Людміла і яе Міхайлавы» (1999); партрэтаў «Мая бабуля Ліда» (1956), І.Мележа, «Аўта-

Н.**Шчасная**. Мая сям'я. 1997.

патрэт» (абодва 1970), У.Дубоўкі (1973), І.Шамякіна, Цёткі (А.Пашкевіч; абодва 1976), А.Макаёнка, М.Матукоўскага (абодва 1979), М.Танка, А.Куляшова («Ля вогнішча»; абодва 1980), У.Саўчанкі, Р.Шырмы, П.Клімука (усе 1981), Я.Купалы, М.Багдановіча (абодва 1982), М.Ладзіса («Вярнуўся», 1985), С.Красікава, І.Антонава (абодва 1987), «Думаючы пра Чэхава» (1988), Р.Суруса (1996), «Ефрасіння Полацкая» (1997), «Промні натхнення А.Пушкіна» (1999), Ф.Скарыны, «І.Фёдараў і П.Мсціславец», А.Романа, «Пясочны гадзіннік» (аўтапартрэт; усе 2000), А.Анікейчыка (2001), С.Акружной (2003) і інш.; пейзажаў, нацюрмортаў, шэрагу графічных твораў. Аформіла кнігі «Калінавая рукавічка» А.Васілевіч (1963), «Матрошкіны казкі» І.Бурсава (1968), «Рыжая палянка» Д.Бічэль-Загнетавай (1971), «Крылы» М.Хведаровіча (1973), «Заручыны» П.Макаля (1979), «Пра дзеда Аяяй і бабку Оёёй» А.Лойкі (1984). Выканала размалёўкі на фасадзе НДІ буд. матэрыялаў (1966), у рэстаране пры гасцініцы «Свіслач» (1978), вітражы ў ВА «Гарызонт» (1982) у Мінску. Творчасці ўласцівы мяккасць і лірызм светаадчування, экспрэсіўная тэхніка, арыгінальнасць колеравых вырашэнняў.

Тв.: Искры моей жизни. Мн., 2001.

Л.Ф.Салавей.

ШЧА́СЦЕ, паняцце маральнага ўсведамлення, якое адпавядае ўнутр. задаволенасці чалавека ўмовамі свайго быцця, паўнаце і асэнсаванасці жыцця, ажыццяўленню свайго чалавечага прызначэння. У Стараж. Грэцыі першапачаткова Ш. (eudaimonia) атаясамлівалася з апекаваннем багоў. Эпікурэйцы (гл. *Эпікурэізм*) звязвалі Ш. з асалодай (*геданізм*), а стоікі — з дасягненнем унутр. свабоды, незалежнай ад абставін лёсу. Згодна з хрысц. вучэннем (Фама Аквінскі і інш.) забяспечыць Ш. можа толькі Бог. Для многіх філас. і этычных вучэнняў 20 ст. характэрна інтэрпрэтацыя Ш. ў экзістэнцыяльным плане, як суб'ектыўнае перажыванне чалавекам стану адзінства сутнасці і існавання. Феномену Ш. ўласцівы нарматыўна-каштоўнасны характар. Як і *мара*, Ш. з'яўляецца пачуццёва-эмацыянальнай формай *ідэалу*, але ў адрозненне ад яе ўяўляе сабой не абстрактны ўзор, а здзяйсненне імкненняў асобы. Адчуванне Ш. непарыўна звязана з забеспячэннем якасці жыцця асобы, уплывае на фарміраванне пэўнай жыццёвай пазіцыі. Гл. таксама *Аптымізм і песімізм, Эўдэманізм.*

С.А.Яцкевіч.

ШЧА́ТКАВА, археалагічныя помнікі (гарадзішча і 3 селішчы) каля в. Шчаткава Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл. Даследаваліся ў 1930 А.М.Ляўданскі, у 1959 Я.Г.Краскоўская, у 1963 Л.Д.Побаль. Гарадзішча (пляцоўка авальная, 120×75 м, з боку поля ўмацавана 2 валамі і равамі) адносіцца да ранняга жал. веку (мілаградская і зарубінецкая культуры), датуецца канцом 6 ст. да н.э. — 1—2 ст. н.э. На ім выяўлены паўзямлянкавая пабудова, заглыбленая ў мацярык на 0,5 м, рэшткі агнішча, фрагменты ляпных гладкасценных і штрыхаваных пасудзін, у т.л. гаршкі і міскі з слабапрафіляваным тулавам і плоскім днішчам. Сярод знаходак жал. нож, шыла, шпілька, рыбалоўны кручок, гліняныя абломкі тыгляў, прасліцы, грузікі, каменныя брускі, крамянёвыя прылады працы, упрыгожанні з грыбападобнымі навершамі, падковападобная і позналатэнская фібулы, трапецападобная падвеска, дэкарыраваная кропкавымі адбіткамі, пярсцёнак, 2 шкляныя антычныя пацеркі і інш. Селішча-1 (каля ўсх. боку гарадзішча) адносіцца да зарубінецкай і быхаўскакалочынскай культур і часоў Кіеўскай Русі. На ім выяўлены 2 паўзямлянкавыя жытлы памерамі 3,7×3,3 м і 3×3 м, у куце аднаго жытла рэшткі печы-каменкі. Знойдзены жалезныя нож і шпілька, фрагменты слабапрафіляваных гаршкоў. У другой паўзямлянцы знойдзены фрагменты ляпной гладкасценнай керамікі з расчосамі, жал. цвікападобныя шпількі і шпора. У комплекс уваходзяць яшчэ 2 селішчы (у 1962—63 абследаваў Побаль).

Л.Д.Побаль.

ШЧА́ЎЕ (Rumex), род кветкавых раслін сям. драсёнавых. Каля 200 відаў. Пашыраны ў нетрапічных зонах і ў гарах тропікаў. На Беларусі 19 відаў. Найб. вядомыя Ш.: вераб'інае, або малое, ці шчаўлюк (R. acetosella), кіслае, або звычайнае (R. acetosa), конскае (R. confertus), кучаравае (R. crispus), лясное (R. sylvestris), пірамідальнае (R. thyrsiflorus). Трапляюцца на лугах, узлесках, травяністых схілах, балотах. Культывуюць садовыя формы і сарты Ш. кіслага і маршчакаватага (R. rugosus).

Адна- і шматгадовыя травяністыя і паўкустовыя расліны выш. да 120 см. Сцёблы прамыя, разгалінаваныя. Лісце ў прыкаранёвай разетцы, сцэбэльнае, лінейнае ці стрэлкападобнае. Кветкі дробныя, сабраныя ў мяцёлчатае суквецце. Плод арэшкападобны. Лек., агароднінныя, кармавыя расліны, многія віды — пустазелле.

Дз.І.Траццякоў.

ШЧАЎЕВАВО́ЦАТНАЯ КІСЛАТА́, дыкарбонавая кіслата, $C_4H_4O_5$ (HO-OC-C(OH)-CH-COOH. Зыходны субстрат *трыкарбонавых кіслот цыкла.* Неабходна для нармальнага абмену рэчываў і энергіі, звязвае вугляводны абмен і абмен амінакіслот, удзельнічае ў працэсах *трансамінавання.*

Існуе ў выглядзе 2 таўтамерных форм і цыс-транс-ізамераў. Солі і эфіры Ш.к. — аксалаацэтаты. У арганізме чалавека і жывёл сінтэзуецца з піравінаграднай к-ты і вугляк ислага газу і пры трансамінаванні аспарагінавай кіслаты. Пры адноснай нястачы Ш.к. (напр., галаданне, цукровы дыябет) значна павялічваецца ўтварэнне кетонавых цел (напр., ацэтону) і развіваецца метабалічны *ацыдоз.*

І.М.Семяненя.

ШЧАЎЕВАКІ́СЛАЕ БРАДЖЭ́ННЕ, аэробны ферментатыўны акісляльна-аднаўляльны працэс, які вядзе да ўтварэння *шчаўевай кіслаты.* Уласціва некат. бактэрыям і грыбам (групы аскаміцэтаў, базідыяміцэтаў, зігаміцэтаў). Зыходнае рэчыва для Ш.б. — *шчаўева-воцатная кіслата.* Актываванне Ш.б. ў арганізме чалавека і млекакормячых пры развіцці грыбковых інфекцый, дысбактэрыёзе кішэчніка садзейнічае ўтварэнню аксалатных камянёў у мочавывадных шляхах. Выкарыстоўваецца ў мікрабіял.

1 2 3 4 5

Шчаўе: 1 — кіслае; 2 — кучаравае; 3 — конскае; 4 — тупалістае; 5 — вераб'інае.

і біятэхнал. прам-сці для атрымання шчаўевай к-ты і яе солей.
І.М.Семяненя, А.Р.Давыдоўскі.

ШЧА́ЎЕВАЯ КІСЛАТА́, двухасноўная арганічная кіслата, $C_2H_2O_4$ (HO-OC-COOH). Утвараецца ў выніку акісляльнага дэзамінавання *гліцыну*, паступае ў арганізм з ежай і сінтэзуецца мікрафлорай тоўстага кішэчніка.

Бясколернае крышт. рэчыва, мал. м. 90, $t_{пл}$ 189,5 °С, гіграскапічная, раствараецца ў вадзе, спірце, эфіры. Адна з найб. моцных *карбонавых кіслот*, актыўны аднаўляльнік. Атрымліваюць награваннем мурашынакіслага натрыю да 350 °С і інш. метадамі. Солі Ш.к. — *аксалаты*. Не падвяргаецца біяхім. ператварэнням у арганізме і выдзяляецца з мачой і жоўцю (у невял. колькасці) у выглядзе кальцыевай солі — аксалату кальцыю. Гідра- і дыгідрааксалаты кальцыю часам выпадаюць у мачавых шляхах у выглядзе пяску або камянёў (*мочакамянёвая хвароба*). Назапашванне Ш.к. ў арганізме чалавека ў выніку генет. парушэння абмену гліцыну і яго метабаліту (гліаксілавай к-ты) — прычына спадчыннай хваробы аксалозу (пашкоджанне нырак з развіццём нырачнай недастатковасці). Выкарыстоўваецца Ш.к. ў тэкст. і папяровай прам-сці, у аналіт. хіміі, для ачысткі металаў ад іржы і інш.
І.М.Семяненя.

ШЧА́ЎЕВЫ АЛЬДЭГІ́Д, тое, што *гліаксаль*.

ШЧАЎРЫ́ЦЫ, род птушак сям. сітаўкавых; гл. *Конікі*.

ШЧАЦІНАХВО́СТ (Chaiturus), род кветкавых раслін сям. губакветных (ясноткавых). 1 від — Ш. шандравы (C. marrubiastrum). Пашыраны ў Еўразіі, як заносны — у Паўн. Амерыцы. На Беларусі рэдкі, трапляецца на сметніках, каля жылля, уздоўж дарог.

Двух-, часам аднагадовая травяністая расліна выш. 25—100 см. Сцёблы прамастойныя. Лісце суцэльнае. Кветкі бледна-ружовыя, у густых шматкветкавых несапраўдных кальчаках. Плод — арэшак.
Дз.І.Траццякоў.

ШЧАЦІНАХВО́СТКІ (Thysanura), атрад першаснабяскрылых насякомых. Больш за 400 відаў. Пашыраны пераважна ў тропіках і субтропіках, сінантропныя іх віды — у больш халодных абласцях. Жывуць у лясным подсціле, у шчылінах кары, глебе, мурашніках, жылых памяшканнях. На Беларусі найб. трапляюцца 2 віды — лускаўніца звычайная, або цукровая (Lepisma saccharina), і тэрмобія хатняя (Thermobia domestica).

Даўж. 8—20 мм. Цела верацёнападобнае, у большасці ўкрытае лускавінкамі. Вусікі доўгія, ніткападобныя. Брушка з 2 і больш членістымі шчацінкамі і доўгай хваставой ніткай на канцы (адсюль назва). Вочы фасетачныя. Ротавыя органы грызучыя. Апладненне вонкава-ўнутранае. Развіццё па тыпе протаметабаліі (гл. *Метамарфоз*). Кормяцца жывёльнымі і расл. рэшткамі. Псуюць кнігі, крухмал, цукар.

ШЧАЦІНКАСКІ́ВІЧНЫЯ (Chaetognatha), тып беспазваночных жывёл. Каля 50 відаў. Пашыраны ва ўсіх морах. Пераважна планктонныя, ёсць донныя віды. Найб. вядомая марская стрэлка (Sagitta).

Даўж. ад 5 мм да 10 см. Цела стрэлкападобнае, шклопадобна-празрыстае. Падзелена на галаўны, тулаўны і хваставы аддзелы; аблямаванае бакавымі (парнымі) і хваставымі плаўнікамі. На галаве — рот, органы пачуццяў і 2 бакавыя групы серпападобных хапальных шчацінак (адсюль назва). Крывяноснай, дыхальнай і выдзяляльнай сістэм няма. Гермафрадыты. Развіццё прамое. Кормяцца планктоннымі беспазваночнымі, зрэдку маляўкамі рыб.

ШЧО́ГАЛЬ (Tringa erythropus), птушка сям. бакасавых атр. сеўцападобных. Пашыраны ў Паўн. Еўразіі ў тундры і лесатундры. На Беларусі нешматлікі пралётны від.

Даўж. цела 31—34 см, маса да 156 г. Спіна зеленавата-бурая з цёмнымі папярочнымі стракацінамі, пер'е надхвосця і падпахавае крылаў белае. Дзюба доўгая, тонкая, ледзь загнутая ўніз, чырв. з цёмным канцом. Ногі чырванавата-бурыя, доўгія. Нясе 4 яйцы. Корміцца воднымі беспазваночнымі, маляўкамі рыб і інш.

Шчогаль: 1 — восенню; 2 — вясной.

ШЧОЛАЧНАЗЯМЕ́ЛЬНЫЯ МЕТА́ЛЫ, хімічныя элементы гал. падгрупы II групы перыяд. сістэмы элементаў Дз.І.Мендзялеева: *кальцый* Ca, *стронцый* Sr, *барый* Ba, *радый* Ra. Аксіды Ш.м. (паводле тэрміналогіі алхімікаў — «землі») надаюць вадзе шчолачную рэакцыю (адсюль назва). Атамы Ш.м. маюць на знешняй абалонцы па 2 *s*-электроны і 6 *p*-электронаў; ступень акіслення +2. Хім. актыўнасць Ш.м. нарастае ад кальцыю да радыю.

ШЧО́ЛАЧНЫЯ ГО́РНЫЯ ПАРО́ДЫ, магматычныя (вулканічныя, гіпабісальныя, плутанічныя) горныя пароды, у якіх павялічана колькасць *шчолачных металаў* (Na, K). У зямной кары Ш.г.п. каля 1% па масе. Адрозніваюць *нефелінавыя сіеніты*, уртыты, іяліты і інш. Паводле колькасці SiO_2 (% па масе) Ш.г.п. падзяляюць на ультраасноўныя (<44), асноўныя (44—53), сярэднія (53—64), кіслыя (64—70); яны аб'ядноўваюць 19 сем'яў. Паводле суадносін Na_2O/K_2O адрозніваюць серыі: натрыевую (<4), каліева-натрыевую (1—4), каліевую (<1 — для ультраасн. і асн., <0,4 — для сярэдніх і кіслых Ш.г.п.). Сярод каліевай серыі адрозніваюць пароды з нармальнай (лейцыціты і інш.) і павышанай (лампраіты) магнезіяльнасцю. Гал. пародаўтваральныя мінералы: *алівін*, клінапіраксен, меліліт, *слюды*, натрыевыя і каліевыя фельдшпатоіды, шчолачны *палявы шпат, плагіяклаз, альбіт, кварц* і інш.

Структура дробназярністая; тэкстура масіўная, парфірападобная, палоскавая. Колер шэры, часам зеленавата- або ружавата-шэры. Пашыраны на стараж. платформах, шчытах, у кансалідаваных складкавых абласцях і на вулканічных астравах. Выкарыстоўваюць у вытв-сці гліназёму, шкла, керамікі. З гэтымі пародамі звязаны радовішчы рэдкіх (ніобій, цырконій і інш.) і рэдказямельных элементаў, слюд, жалезных і фасфатных руд, каштоўных і паўкаштоўных камянёў.

ШЧО́ЛАЧНЫЯ МЕТА́ЛЫ, хімічныя элементы гал. падгрупы I групы перыяд. сістэмы элементаў Дз.І.Мендзялеева: *літый* Li, *натрый* Na, *калій* K., *рубідый* Rb, *цэзій* Cs, *францый* Fr. Назву атрымалі ад гідравокісаў Ш.м., наз. едкімі *шчолачамі*. Атамы Ш.м. маюць на вонкавай абалонцы па 1 *s*-электроне, на папярэдняй — *2 s*- і 6 *p*-электронаў (акрамя Li); ступень акіслення +1. Вызначаюцца блізкімі фіз. і хім. ўласцівасцямі (асабліва K, Rb, Cs). Характарызуюцца высокай хім. актыўнасцю, якая нарастае ад літыю да францыю.

ШЧО́ЛАЧЫ, моцныя *асновы*, растваральныя ў вадзе. Водныя растворы Ш. маюць высокую канцэнтрацыю гідраксільных іонаў OH^-. Да Ш. адносяцца гідравокісы *шчолачных металаў, шчолачназямельных металаў* і *амонію*.

Цвёрдыя растворы. Моцныя асновы (асабліва едкія Ш.), паглынаюць CO_2 і H_2O з паветра. Едкія Ш. добра раствараюцца ў вадзе. Водныя растворы едкіх Ш. разбураюць шкло, расплавы — фарфор і плаціну. Атрымліваюць электролізам хларыдаў шчолачных металаў, абменнай рэакцыяй паміж растворам солі шчолачнага металу і гідрааксідам шчолачназямельнага металу і інш. Гл. таксама *Калію гідраксід, Кальцыю гідраксід, Натрыю гідраксід.*

ШЧО́ЛКАВА, горад у Маскоўскай вобл. Расіі, на р. Клязьма (бас. р. Ака). Вядомы з 1521—22, з 1925 горад. 107,3 тыс. ж. (1996). Чыг. станцыя. Прам-сць: тэкст. (баваўняная, шаўковая, вытв-сць тэхн. тканін, фетравых вырабаў), хім. (лакі, фарбы), вітамінная, машынабудаванне і металаапрацоўка.

ШЧО́ЛКІН Кірыла Іванавіч (17.5.1911, Тбілісі — 8.11.1968), расійскі фізік. Чл.-кар. АН СССР (1953). Тройчы Герой Сац. Працы (1949, 1950, 1954). Скончыў Крымскі пед. ін-т (1932, г. Сімферопаль). Працаваў у Ін-це хім. фізікі АН СССР, адначасова ў Маскоўскім фіз.-тэхн. ін-це. Навук. працы па фізіцы гарэння і дэтанацыі газаў у набліжэнні да ядз. выбуху. Значны ўклад яго ў вырашэнне атамнай праблемы ў

СССР. Ленінская прэмія 1958. Дзярж. прэміі СССР 1949, 1951, 1953.

Тв.: Газодинамика горения. М., 1963 (разам з Я.К.Трошыным).

Літ.: Асташенков П.Т. Пламя и взрыв. 2 изд. М., 1978.

К.І.Шчолкін.

М.А.Шчорс.

ШЧО́МЫСЛІЦА, вёска ў Мінскім р-не, на аўтадарозе Мінск—Дзяржынск. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 9 км на ПдЗ ад Мінска, 2 км ад чыг. ст. Памыслішча. 1655 ж., 571 двор (2003). Навук.-доследная гаспадарка БДУ «Шчомысліца». Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Брацкія могілкі сав. воінаў.

ШЧОРС Мікалай Аляксандравіч [6.6.1895, пас. Сноўск (цяпер г. Шчорс) Чарнігаўскай вобл., Украіна — 30.8.1919], герой грамадзянскай вайны на Украіне. З сям'і чыгуначніка ст. Стоўбцы Мінскай вобл. Скончыў Кіеўскую ваен.-фельчарскую школу (1914), Віленскае ваен. вучылішча (1916, з 1915 у г. Палтава). Удзельнік 1-й сусв. вайны. У лютым 1918 стварыў у пас. Сноўск і ўзначаліў чырвонагвардз. атрад, які змагаўся супраць герм. акупантаў на Украіне. З мая 1918 удзельнічаў у фарміраванні партыз. атрадаў у Самарскай і Сімбірскай губ. З вер. 1918 камандзір Багунскага палка, з кастр. 1918 — брыгады (Багунскі і Тарашчанскі палкі), якія змагаліся з пятлюраўцамі ў баях за Чарнігаў, Кіеў, Фастаў і інш. З сак. 1919 камандзір 10-й Укр. сав. дывізіі (са жн. 1919 — 44-я стралк. дывізія), якая ў складзе Укр. фронту вяла баі супраць пятлюраўцаў і польскіх войск. Загінуў у баі пад г. Корасцень. Пахаваны ў г. Самара. Яго імем названы г. Шчорс (да 1935 Сноўск) Чарнігаўскай вобл., г.п. Шчорск (да 1939 Бажадараўка) Днепрапятроўскай вобл., вуліцы ў многіх гарадах, у т.л. ў Мінску, Стоўбцах; партыз. атрады і брыгады, што змагаліся на Беларусі супраць фаш. акупантаў у Вял. Айч. вайну. Помнікі ў Кіеве, Шчорсе, Стоўбцах, Корасцені, Жытоміры, на месцы яго гібелі. У г. Шчорс мемарыяльны музей Ш.

Літ.: Исакович В.М. Микола Щорс. Київ, 1957; Карпенко В.В. Щорс. М., 1974. *І.П.Хаўратовіч.*

ШЧО́РСАЎСКАЯ ДЗМІ́ТРЫЕЎСКАЯ ЦАРКВА́, помнік архітэктуры барока ў в. Шчорсы Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. Пабудавана ў 1770—76 уладальнікам маёнтка І.Храптовічам як уніяцкая царква; буд-вам кіраваў франц. арх. Я.Габрыэль. Храм 1-нефавы, прамавугольны ў плане, з прамавугольнымі апсідай і сакрыстыямі. На гал. фасадзе 4-калонны аркадны порцік з трохвугольным франтонам і фігурны шчыт, за якім размешчана нізкая чацверыковая вежа-званіца з 4-схільным пакрыццём. Бакавыя фасады шырокім прафіляваным карнізам падзелены на 2 ярусы: ніжні расчлянёны невял. прамавугольнымі аконнымі праёмамі і плоскімі лапаткамі ў прасценках; верхні прарэзаны лучковымі аконнымі праёмамі і завершаны прафіляваным карнізам. У інтэр'еры сцены дэкарыраваны прафіляваным карнізам, нішамі, падвойнымі пілястрамі карынфскага ордэра.

Шчорсаўская Дзмітрыеўская царква.

ШЧО́РСАЎСКІ ПАЛА́ЦАВА-ПА́РКАВЫ КО́МПЛЕКС, помнік архітэктуры і садова-паркавага мастацтва 2-й пал. 18 — пач. 19 ст. ў в. Шчорсы Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. Сфарміраваўся ў б. маёнтку Храптовічаў (вядомы з 16 ст.), з канца 19 ст. належаў графу К.А.Буцянёву. Створаны падканцлерам ВКЛ І.Л.Храптовічам. Уключаў палац, павільён б-кі, 2 флігелі, службовыя і гасп. пабудовы, парк. Палац пабудаваны ў 1770—76 арх. Я.Габрыэлем паводле праекта Дж.Сака з удзелам К.Спампані. Будынак мураваны, 1-павярховы, П-падобны ў плане, з парадным дваром; накрыты вальмавым дахам з мансардавай ч. і купальным завяршэннем у цэнтры. Гал. фасад вылучаны 4-пілястравым порцікам з трохвугольным франтонам, паркавы фасад — паўкруглым эркерам з радам авальных люкарнаў. У афармленні інтэр'ераў удзельнічалі мастакі Манькоўскі і А.Смуглевіч, выкарыстаны карціны Ю.Карчэўскага. Больш спрошчаную арх. трактоўку мелі 1-павярховыя крылы (1777), рытмічна расчлянёныя на франтальных фасадах прамавугольнымі аконнымі праёмамі і пілястрамі ў прасценках. У пач. 19 ст. да палаца прыбудаваны 2 сіметрычна размешчаныя 1-павярховыя прамавугольныя ў плане флігелі (захаваўся заходні). Флігелі агароджай са слупоў аб'ядноўваліся з манум. брамай у стылі барока. Цэнтр. корпус палаца разбураны ў Вял. Айч. вайну (захаваліся скляпеністыя падвалы). У канцы 18 ст. спецыяльна для бібліятэкі (каля 10 тыс. тамоў кніг, стараж. рукапісы, архіў) пастаўлены 2-павярховы будынак у стылі класіцызму. У б-цы працавалі гісторыкі, паэты, у т.л. І.Лялевель, М.Пачобут-Адляніцкі, М.Вольскі, У.Сыракомля, Я.Чачот (як бібліятэкар), у 1819 і 1820 у Шчорсах жыў А.Міцкевіч. У 1915 граф Буцянёў ч. б-кі (4,5 тыс. тамоў) перадаў Кіеўскаму ун-ту, астатняя ч. трапіла ў г. Кракаў (Польшча). Сярод гаспадарчых пабудоў (кухня, майстэрня, карэтная і інш.) вылучаўся будынак вяндлярні (канец 19 — пач. 20 ст.) — круглая вежападобная пабудова пад высокім гонтавым дахам, заломам на пакатым шатровым пакрыцці. Парк (пл. каля 40 га) пейзажнага тыпу, закладзены ў канцы 18 ст. У парку помнік прыроды — т.зв. дуб Міцкевіча. За 1 км на З ад комплексу ў рэтраспектыўных формах замкавага дойлідства пабудаваны гасп. двор, т.зв. мураванка Храптовічаў (карпусы стайняў, вуглавыя круглыя вежы).

Шчорсаўскі палацава-паркавы комплекс. З гравюры 19 ст.

ШЧО́РСЫ, вёска ў Навагрудскім р-не Гродзенскай вобл., на скрыжаванні аўтадарог на Любчу, Івянец, Карэлічы. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 28 км на У ад г. Навагрудак, 190 км ад Гродна, 47 км ад чыг. ст. Наваельня. 614 ж., 294 двары (2003). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Брацкія магілы сав. воінаў, ахвяр фашызму. Помнікі землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну, і М.А.Шчорсу. Помнікі архітэктуры: *Шчорсаўская Дзмітрыеўская царква* і *Шчорсаўскі палацава-паркавы комплекс.*

Вядомы з сярэдзіны 15 ст. як уладанне Храбтовічаў (*Храптовічаў*). З 15 ст. ў Ш. існавала царква св. Дзмітрыя (Шчорсаўская Дзмітрыеўская царква), з 2-й пал. 18 ст. — Шчорсаўскі палацава-паркавы комплекс. У 1789 у вёсцы Ш. 2541 ж., 484 дымы, парафіяльная школа. З 1795 у складзе Рас. імперыі. У 1882 у Ш. існавала ланкастэрская школа на 300 сял. хлопчыкаў. У час паўстання 1830—

31 двор Ш. захоплены паўстанцамі. У 1845 у маёнтку Ш. 62 вёскі (8524 душы прыгонных сялян, 1130 двароў), 20 513 дзесяцін зямлі. У 1897 у сяле Ш. 41 ж., 7 двароў, вучылішча, 2 царквы, карчма, валасное праўленне. З 1921 Ш. ў складзе Польшчы, вёска, цэнтр гміны Навагрудскага пав., 400 ж., у фальварку Ш. 108 ж. (1921). З 1939 у БССР, вёска, з 1940 цэнтр сельсавета Любчанскага р-на Баранавіцкай, з 1954 Гродзенскай вобл., з 1956 цэнтр сельсавета Навагрудскага р-на.

М.Ф.Спірыдонаў.

ШЧОТКАЯЗЫ́ЧНЫЯ ПАПУГА́І, падсямейства птушак; гл. *Лоры*.

ШЧО́ЎНА, возера ў Міёрскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Вята (цячэ праз возера), за 7 км на ПнЗ ад г. Міёры, каля в. Рускае Сяло. Пл. 1,14 км^2, даўж. 1,48 км, найб. шыр. 950 м, найб. глыб. 2,6 м, даўж. берагавой лініі 4,1 км. Пл. вадазбору 357 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу, круглаватая, выцягнутая з ПдЗ на ПнУ. Схілы катлавіны на З, ПнЗ і ПдЗ слаба выражаныя, забалочаныя, на ПнУ, У і Пд спадзістыя. Берагі нізкія, пясчаныя або тарфяністыя, забалочаныя і ўкрытыя хмызняком, на З, ПнЗ і ПдЗ сплавінныя. Дно сапрапелістае. Зарастае, шыр. паласы прыбярэжнай расліннасці 100—150 м.

ШЧУ́КІН Аляксандр Мікалаевіч (22.7.1900, С.-Пецярбург — 11.6.1990), расійскі вучоны ў галіне радыётэхнікі і радыёфізікі. Акад. АН СССР (1953, чл.-кар. 1946). Ген.-лейтэнант-інжынер (1971). Двойчы Герой Сац. Працы (1956, 1975). Скончыў Ленінградскі электратэхн. ін-т (1927), дзе выкладаў у 1929—41 (з 1939 праф.), адначасова ў Ваенна-марской акадэміі імя Крылова і інш. ВНУ. Працаваў у Цэнтр. радыёлабараторыі трэста з-даў слабага току, Ленінградскім электрафіз. ін-це і інш. Навук. працы па метадах радыёсувязі, тэорыі ваганняў, радыёлакацыі, выкарыстанні тэорыі імавернасцей, тэорыі аўтам. рэгулявання і кіравання. З 1969 старшыня Навук. савета АН СССР па комплекснай праблеме «Распаўсюджванне радыёхваль». Ленінская прэмія 1957. Дзярж. прэмія СССР 1952.

Тв.: Динамические и флюктуационные ошибки управляемых объектов. М., 1961; Теория вероятностей и ее применение в инженерно-технических расчетах. М., 1974.

ШЧУ́КІН Аляксандр Уладзіміравіч (19.1.1946, Вена, Аўстрыя — 18.8.1988), савецкі касманаўт-выпрабавальнік. Лётчык-выпрабавальнік 1-га класа (1984). Бацькі паходзяць з Беларусі. Скончыў Качынскае вышэйшае ваен. авіяц. вучылішча лётчыкаў (1970), Маскоўскі авіяц. ін-т (1980). З 1981 у групе спец. падрыхтоўкі па праграме «*Буран*». Дублёр касманаўта-даследчыка касм. карабля «Саюз ТМ-4» (1987). Загінуў у выпрабавальным палёце.

У.С.Ларыёнаў.

ШЧУ́КІН Барыс Васілевіч (17.4.1894, Масква — 7.10.1939), расійскі акцёр. Нар. арт. СССР (1936). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча (1916), Аляксандраўскае ваен. вучылішча (1918). З 1920 у 3-й Студыі Маскоўскага Маст. акад. т-ра (з 1926 Т-р імя Я.Вахтангава). Яго творчасці былі ўласцівы арганічнасць, пачуццё жыццёвай праўды, імправізацыйная свабода, спалучэнне прыёмаў буфанады і гратэску з глыбокім драматызмам. Этапнымі ў

А.М.**Шчукін**.

Б.В.**Шчукін**.

развіцці рас. тэатр. мастацтва сталі створаныя ім ролі: Ягор Булычоў («Ягор Булычоў і іншыя» М.Горкага), Кюрэ («Цуд святога Антонія» М.Метэрлінка), Тарталья («Прынцэса Турандот» К.Гоцы), Палоній («Гамлет» У.Шэкспіра), Павел Суслаў («Вірынея» Л.Сейфулінай і В.Праўдухіна). Як адзін з рэжысёраў удзельнічаў у пастаноўцы п'ес «Тэмп» М.Пагодзіна (1930), «Гамлет» Шэкспіра (1932), «Чалавечая камедыя» (паводле А. дэ Бальзака, 1934) і інш. Здымаўся ў кіно. Дзярж. прэмія СССР 1941.

Літ.: Бачелис Т. Великий советский артист Б.В.Шукин. М., 1956; Б.В.Шукин: Статьи, воспоминания, материалы. М., 1965.

ШЧУ́КІН Леў Кірылавіч (н. 29.10.1923, г. Нагінск Маскоўскай вобл., Расія), савецкі ваенны лётчык. Герой Сав. Саюза (1951). Палкоўнік (1964). Скончыў Адэскую ваен. авіяц. школу пілотаў (1944), Ваенна-паветр. акадэмію (1956). У Чырв. Арміі з 1941. Удзельнік Вял. Айч. вайны. У час *карэйскай вайны 1950—53* на знішчальніку МіГ-15 здзейсніў 121 баявы вылет, збіў 17 амер. і брыт. рэактыўных самалётаў (15 асабіста і 2 у складзе групы). Быў двойчы збіты, паранены. Пасля вяртання з Карэі на камандных пасадах. У 1945—48 і 1957—77 служыў у ВВА. Ваен. саветнік у час баявых дзеянняў у Егіпце (1967—70). З 1977 у адстаўцы, жыве ў Мінску.

Літ.: Качук Н. Покрышкин из нашего города: Неизвестный герой неизвестной войны // Армия. 1996. №1.

Ю.В.Бажэнаў.

ШЧУКО́ Уладзімір Аляксеевіч (17.7.1878, г. Тамбоў, Расія — 18.1.1939), рускі архітэктар. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ у Л.М.*Бенуа* (1896—1904). Яго работы адметныя пошукамі простых лаканічных форм, звязаных з новымі тыпамі грамадскіх будынкаў мадэрну: у С.-Пецярбургу — дамы на Кіраўскім (б. Каменнаостраўскім) праспекце (1908—11), прапілеі-ўезд у Смольны (1923—25, з У.Гельфрэйхам); драм. т-р імя М.Горкага ў г. Растоў-на-Доне (1930—35); рас. павільён на Міжнар. выстаўцы ў Рыме (1910—11, з Э.Шталбергам); у Маскве — новы будынак б-кі імя У.І.Леніна (цяпер Рас. дзярж. б-ка, 1928—41), Вял. Каменны мост (1936—38, з М.Мінкусам), гал. павільён Усерас. с.-г. выстаўкі (1939, у сааўт.); Дом урада Абхазіі ў г. Сухумі (1932—39). Аўтар эскізаў дэкарацый і касцюмаў для «Старадаўняга тэатра» (1910-я г.), т-ра драмы імя А.Пушкіна і Вял. драм. т-ра (1920—30-я г.) у С.-Пецярбургу, спектакля «Барыс Гадуноў» Пушкіна ў Малым т-ры ў Маскве (1937), малюнкаў і акварэляў.

Літ.: Толстая И.А. В.Щуко // Зодчие Москвы. М., 1988. Кн. 2.

У.Шчуко. Расійская дзяржаўная бібліятэка. 1928—41.

ШЧУП (ваен.), прылада для выяўлення мін, бомбаў і інш. боепрыпасаў у грунце (да 15 см) і пад снегам (на ўсю таўшчыню покрыва, да зямлі). Ш. заводскай вытв-сці складаецца з завостранага стальнога стрыжня і рукаяткі (з 3 драўляных звёнаў). Бываюць даўж. 0,8 м (для дзеянняў сапёра ў ляжачым становішчы) і 1,5—2 м (для дзеянняў у стаячым становішчы). Ш. праколваюць грунт пад вуглом 25—45° на адпаведную глыбіню праз кожныя 20 см; месца, дзе стрыжань натыкаецца на цвёрды прадмет, уважліва аглядваюць. Выкарыстоўваюцца таксама глыбінныя Ш. даўж. да 6 м, якія ўводзяць у грунт прыдапамозе калаўроціка.

І.А.Шор.

ШЧУПА́К звычайны (Esox lucius), рыба сям. шчупаковых. Пашыраны ў прэсных водах Еўразіі і Паўн. Амерыкі. Жыве звычайна ў прыбярэжнай зоне, у водных зарасніках, у непраточных ці

слабапраточных водах. На Беларусі трапляецца паўсюдна.

Даўж. да 1,5 м, маса да 35 кг (звычайна да 1 м і 8 кг). Цела тарпедападобнае, галава вял., пашча шырокая. Афарбоўка зменлівая, залежыць ад асяроддзя: шэра-зеленаватая, шэра-жаўтаватая, шэра-бурая, спіна цямнейшая, бакі з буйнымі бурымі ці аліўкавымі плямамі, якія ўтвараюць папярочныя палосы. Нянарныя плаўнікі жаўтавата-шэрыя, бурыя з цёмнымі плямамі; парныя — аранжавыя. Кормяцца пераважна рыбай. Аб'ект промыслу і развядзення.



Зборны шчуп: а — прамая ўстаноўка наканечніка; б — нахіленая ўстаноўка наканечніка.

Шчупак.

ШЧУПА́К Юзя (сапр. Сайкоўскі Язэп Язэпавіч; 1890, г.п. Радашковічы Маладзечанскага р-на Мінскай вобл. — 2-я пал. 1936), бел. пісьменнік і культ. дзеяч. Скончыў Радашковіцкае гар. вучылішча. Працаваў мулярам. Выконваў розныя мазаічныя работы ў Радашковічах, Івянцы, Заслаўі, Мінску, Красным. Друкаваўся з 1908 у газ. «Наша ніва» (вершы «Весела, смела...», «Як гляджу на свой край», «Песня», «Пташка»). Пісаў допісы пра тэатр, асветніцкае і культ. жыццё краю. У Радашковічах ставіў на аматарскай сцэне бел. спектаклі, у якіх выступаў і як акцёр («Міхалка» Далецкіх, «Паўлінка» Я.Купалы і інш.).

Тв.: У кн.: Беларуская дакастрычніцкая паэзія. Мн., 1967.

Літ.: Каханоўскі Г. Адчыніся, таямніца часу. Мн., 1984. *Г.А.Каханоўскі.*

ШЧУ́ПАЛЬЦАВЫЯ (Tentaculata), лафафоравыя (Lophophorata), падаксоніі (Podaxonia), празапігіі (Prosopygia), тып беспазваночных жывёл. 3 кл.: *імшанкі, плечаногія, фараніды*; некат. даследчыкі адносяць іх да самаст. тыпаў. Каля 30 тыс. відаў, з іх сучасных каля 4,3 тыс. Пашыраны ў морах і прэсных вадаёмах. На Беларусі трапляюцца імшанкі.

Маюць другасную поласць цела (*цэлом*), расчляняную на 2 або 3 сегменты. Добра развіты апарат каляротавых шчупальцаў (адсюль першая назва), размешчаны на падковападобным шчупальцаносцы — лафафоры (адсюль другая назва). Кішэчнік петлепадобны, са спінным анусам. Ёсць крывяносная сістэма і 1—2 пары метанефрыдыяў. Планктонная лічынка нагадвае *трахафору*. Іл. гл. да арт. *Імшанкі, Плечаногія, Фараніды.*

ШЧУР (Pinicola enucleator), птушка сям. ўюрковых атр. вераб'інападобных. Пашыраны ў паўн. ч. лясной зоны і ў лясным высакагор'і Еўразіі і Паўн. Амерыкі. На Беларусі спарадычна трапляецца зімой.

Даўж. цела ў сярэднім 20 см, маса да 60 г. Апярэнне самцоў малінава-чырв., крылы і хвост буравата-чорныя, на плячах 2 белыя палоскі. У самкі грудзі бруднавата-жоўта-аранжавыя. Дзюба масіўная, хвост доўгі. Нясе 3—5 яец. Корміцца пладамі, насеннем, ягадамі, зрэдку насякомымі.

Шчур: 1 — самка; 2 — самец.

ШЧУ́СЕЎ Аляксей Віктаравіч (8.10.1873, Кішынёў — 24.5.1949), расійскі архітэктар, тэарэтык і гісторык архітэктуры, педагог. Засл. архітэктар СССР (1930). Правадз. чл. Акадэміі архітэктуры СССР (1939). Акад. АН СССР (1943). Вучыўся ў Пецярбургскай АМ у Л.М.*Бенуа* і І.Я.*Рэпіна* (1891—97), з 1910 акад. у ёй. Выкладаў у Строганаўскім маст.-прамысл. вучылішчы (з 1913), Вышэйшых маст.-тэхн. майстэрнях (з 1918), арх. ін-це (1948) і інш. у Маскве. У 1926—29 дырэктар Траціякоўскай галерэі. Арганізатар і першы дырэктар Музея рус. архітэктуры (1946—49, цяпер Дзярж. н.-д. музей архітэктуры яго імя). Першыя найб. значныя работы ў неарускім стылі адметныя разнастайнасцю, маляўнічасцю (Марфа-Мар'інскі манастыр, 1908—12; комплекс Казанскага вакзала, 1914—26; 1941; абедзве ў Маскве). Удзельнічаў у распрацоўцы плана рэканструкцыі Масквы 1918—25, гал. архітэктар Усерас. і саматужна-прамысл. выстаўкі (1922—23). Сярод работ у стылі канструктывізму: НДІ курарталогіі і фізіятэрапіі ў г. Сочы (1927—31), будынак Наркамзема ў Маскве (1928—33; цяпер Мін-ва сельскай гаспадаркі Расіі). Стварыў маўзалей У.І.Леніна (у 1924 у дрэве, у 1929—34 у камені) на Краснай пл. ў Маскве. З выкарыстаннем элементаў класічнай арх. спадчыны будынкі гасцініцы «Масква» (1932—38, у сааўт.), Маскварэцкі мост (1936—38), будынак НКУС на Лубянскай пл. (1940—47), перонная зала станцыі метро «Камсамольская-кальцавая» (адкрыта ў 1952) у Маскве, т-р оперы і балета ў Ташкенце (1940—47). Аўтар праектаў аднаўлення зруйнаваных у Вял. Айч. вайну гарадоў Істра Маскоўскай вобл. (1942—43), Ноўгарад (1943—45), Кішынёў (1947). Істотна паўплываў на фарміраванне сучаснага аблічча Масквы. Аўтар навук. работ па пытаннях забудовы Масквы. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1946, 1948, 1952.

Літ.: Афанасьев К.Н. А.В.Щусев. М., 1978; Журавлев А.М. А.Щусев // Зодчие Москвы. М., 1988. Кн. 2.

ШЧУ́ЧЫН, горад, цэнтр Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл. За 68 км на У ад Гродна, за 7 км ад чыг. ст. Ражанка на лініі Ваўкавыск—Ліда. 16,3 тыс. ж. (2002). *Шчучынскі завод «Аўтапровад»*, прадпрыемствы с.-г. і трактарнага машынабудавання, харч. (*Шчучынскі масласырзавод*) прам-сці. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан, магіла ахвяр фашызму. Помнікі архітэктуры: *Шчучынскі касцёл Святой Тэрэзы*, Свята-Міхайлаўская царква, *Шчучынскі палац*.

Упершыню згадваецца ў пісьмовых крыніцах 1-й пал. 15 ст. ў сувязі з заснаваннем тут трокскім ваяводам П.Лелюшам касцёла. У 2-й пал. 15—17 ст. Ш. належаў Кучукам, Кішкам, Радзівілам, Давойнам, Лімонтам; уваходзіў у склад Лідскага пав. Віленскага ваяв. У вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 Ш. моцна пацярпеў ад войск кн. Хаванскага і атрадаў В.Залатарэнкі, у пач.

А.Шчусеў. Казанскі вакзал у Маскве. 1914—26.

Паўночнай вайны 1700—21 — ад войск Карла XII. У канцы 17 — 1-й пал. 18 ст. мястэчкам Ш. валодалі Юзафовічы-Глябіцкія (Хлябіцкія), потым — Сцыпіёны. У 18 — пач. 20 ст. называўся Шчучын-Літоўскі. У 1718 тут засн. *Шчучынскі піярскі калегіум*. 23.5.1761 Ш. атрымаў герб — у блакітным полі пад залатой каронай сярэбраная манаграма IS [I (gnatus) S(cipion)]. Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) у Рас. імперыі, мястэчка Лідскага пав. Гродзенскай (з 1802) і Віленскай (з 1842) губ. З 1807 Ш. належаў Друцкім-Любецкім. У 1866 у мястэчку 1088 ж., 123 дамы, парафіяльная школа, аптэка, паштовая станцыя, царква, касцёл. У 2-й пал. 18 ст. пабудаваны *Шчучынскі палац*, у 1888 — дрэваапр. з-д. У 1897 — 1742 ж., лячэбніца. У 1905 цэнтр воласці Лідскага пав. Віленскай губ., 1799 мяшчан, валасное праўленне, царква, касцёл, капліца, сінагога, яўр. малітоўны дом, аптэка, паштовая станцыя, вінакурны, цагельны, вапнавы з-ды, 29 крам, 5 корчмаў. У 1914 бібліятэка і архіў Сцыпіёнаў і Друцкіх-Любецкіх перададзены ў музей Чартарыйскіх у Кракаве. З 1921 у складзе Польшчы, цэнтр гміны Навагрудскага ваяв. У 1923 — 1539 ж., 239 будынкаў. У 1929 Ш. — цэнтр *Шчучынскага павета* Навагрудскага ваяв. З 1939 у БССР, з 4.12.1939 цэнтр Шчучынскага р-на Баранавіцкай вобл., з 15.1.1940 гар. пасёлак, 3500 ж. У Вял. Айч. вайну з 25.6.1941 да 13.7.1944 акупіраваны ням. фашыстамі, якія загубілі ў Ш. і раёне 2749 чал. У 1948 у Ш. 7 тыс. ж., у 1959— 6,5 тыс., у 1970 — 10,3 тыс. ж. З 31.8.1962 — горад.

Літ.: Крень И.П., Мараш Я.Н. Щучин: Ист.-экон. очерк. Мн., 1989; Данскіх С.У. Наш Шчучын. Гродна, 2001; Памяць: Гіст.-дак. хроніка Шчучынскага р-на. Мн., 2001. *Р.В.Баравой, У.В.Мальцаў.*

ШЧУ́ЧЫНСКІ ЗАВО́Д «АЎТАПРО́ВАД». Створаны ў г. *Шчучын* у 1958 на базе фанернага з-да. У сярэдзіне 1960-х г. пабудаваны цэх кабелю далёкай сувязі. У канцы 1960-х г. з-д перапрафіляваны на выпуск мантажных правадоў. З 1994 адкрытае акц. т-ва. Асн. прадукцыя (2003): правады (аўтатрактарныя нізкага напружання, мантажныя, мантажныя экраніраваныя, бытавыя, установачныя, для тэлеф. сувязі і інш.), кабелі (мантажныя мнагажыльныя, зварачныя, сілавыя напружаннем да 1000 В, кантрольныя, радыёчастотныя), шнуры арміраваныя, трубкі поліхлорвінілавыя і інш.

Шчучын. Фрагмент забудовы.

ШЧУ́ЧЫНСКІ КАСЦЁЛ СВЯТО́Й ТЭРЭ́ЗЫ, помнік архітэктуры класіцызму ў г. Шчучын Гродзенскай вобл. Пабудаваны ў 1829 пры кляштары піяраў князем К.Друцкім-Любецкім. Мураваны храм выцягнутай крыжова-купальнай кампазіцыі. Дамінуе высокі купал на светлавым васьмерыковым барабане над сяродкрыжжам. На гал. фасадзе паўкалоны і антаблемент ствараюць матыў дарычнага порціка. Вось сіметрыі гал. фасада падкрэслена ўваходным праёмам з сандрыкам, акном у фігурнай ліштве і люкарнай на франтоне. Бакавыя фасады расчлянёны высокімі паўцыркульнымі аконнымі праёмамі, афармлены рустам і завешаны антаблементам. У 1987—89 касцёл рэстаўрыраваны. *С.Г.Багласаў.*

ШЧУ́ЧЫНСКІ МАСЛАСЫРЗАВО́Д. Пабудаваны ў г. *Шчучын* у 1968—70. У 1987 пабудаваны цэх сухога абястлушчанага малака, у 1996 — лакальныя ачышчальныя збудаванні, у 1992 — рэканструяваны сыраробны цэх. З 1998 — адкрытае акц. т-ва. Асн. прадукцыя (2003): масла, сыр «Расійскі», цэльнамалочныя прадукты, малочны цукар, сухая сываратка.

Шчучынскі касцёл святой Тэрэзы.

ШЧУ́ЧЫНСКІ ПАВЕ́Т, адм.-тэр. адзінка ў Польшчы і БССР у 1929—40. Цэнтр — г. *Шчучын*. Утвораны 26.4.1929 з Астрынскай, Васілішкаўскай, Дэмбраўскай, Жалудоцкай, Лябёдскай, Навадворскай, Орлеўскай, Ражанкаўскай, Сабакінцкай, Шчучынскай гмін Лідскага пав. і Каменскай гміны Гродзенскага пав. Уваходзіў у Навагрудскае ваяв. У вер. 1939 далучаны да БССР. З

4.12.1939 у Баранавіцкай вобл. Скасаваны 15.1.1940, на тэр. павета ўтворaны раёны. *В.Л.Насевіч.*

ШЧУ́ЧЫНСКІ ПАЛА́Ц, помнік архітэктуры ранняга класіцызму ў г. Шчучын Гродзенскай вобл. Пабудаваны ў 2-й пал. 18 ст. паводле праекта арх. дэ Фленерса ў парку рэгулярнай планіроўкі (садавод С.Юндзіл). Належаў падскарбію літ. Шчуку, з пач. 19 ст. — кн. Друцкім-Любецкім. Будынак мураваны, сіметрычнай кампазіцыі, прамавугольны ў плане, 2-павярховы, на высокім цокалі. У цэнтры больш нізкая ч. з мансардай, вырашаная ў выглядзе лоджыі з 2 іанічнымі калонамі, па баках — 2-павярховыя аб'ёмы, раскрапаваныя пілястрамі. Фасады па перыметры завершаны развітым карнізам і парапетам з атыкам у цэнтры. Прамавугольныя аконныя праёмы аздоблены сандрыкамі.

Шчучынскі палац.

ШЧУ́ЧЫНСКІ ПІ́ЯРСКІ КАЛЕ́ГІУМ, сярэдняя навуч. ўстанова ў 1718—1832 у г. Шчучын Гродзенскай вобл. У 1718 у Шчучын піяраў запрасіў гаспадар мястэчка Ю.Глябецкі, які перадаў ім мясц. парафіяльны касцёл і ахвяраваў 23 735 злотых. Калі маёнтак перайшоў да яго дачкі Тэрэзы, яна пацвердзіла фундацыю бацькі; тое ж у 1726 зрабіў і сойм. Калегіум пры кляштары св. Георгія засн. ў 1718 (пры ім пэўны час дзейнічалі семінарыя для ордэнскай моладзі, дзе выкладаліся нават усх. мовы, і аптэка). Існаваў на прыватныя ахвяраванні, падпарадкоўваўся Літоўскай навуч. акрузе. Меў 3 класы і 5 выкладчыкаў. У 1783 *Адукацыйная камісія* рэарганізавала калегіум у падакруговае вучылішча (у 1785 у ім было 119, у 1789 — 69 вучняў; у 1803 было 5 класаў і 7 выкладчыкаў). У 1804 з Гродзенскай дамініканскай школы сюды пераведзены фундуш у 40 тыс. злотых гродзенскага старосты А.Храптовіча для ўтрымання 10 юнакоў са збяднелай шляхты, а калегіум пераўтвораны ў 6-класнае пав. вучылішча з гімназічным курсам навучання (выпускнікі мелі права паступаць ва універсітэты). У 1817 было 7 выкладчыкаў і 201 вучань, у 1822 — 152 вучні, у 1823 — 73 вучні. 19.2.1823 тут утворана нелегальнае вучнёўскае т-ва (філіял віленскіх *філаматаў*), якое было раскрыта паліцыяй. У 1825 калегіум ператорваны ў звычайнае 4-класнае пав. вучылішча, у 1832 скасаваны. У ім выкладаў прыродазнавец С.*Юндзіл*, вучыліся філосаф К.*Нарбут*, гісторык-археограф М.*Догель*, геолаг І.*Дамейка*, паэт Ю.Корсак і інш.

Літ.: Белецкий А.В. Исторический обзор деятельности Виленского учебного округа за первый период его существования, 1803—1832. Отд. 3. Вильна, 1906; Сборник материалов для истории просвещения в России. Т. 1. СПб., 1893; Beauvois D. Szkolnictwo Polskie na ziemiach Litewsko-Ruskich, 1803—1832. T. 2. Rzym; Lublin, 1991.

А.Ф.Самусік.

ШЧУ́ЧЫНСКІ РАЁН. Размешчаны на Пн3 Гродзенскай вобл. Утвораны 15.1.1940 (у сучасных межах з 1967). Пл. 1,9 тыс. км². Нас. 57 тыс. чал. (2003), гарадскога 35,1%. Сярэдняя шчыльн. 30 чал. на 1 км². Цэнтр — г. *Шчучын*. Раён уключае г.п. *Жалудок* і *Астрына*, 432 сельскія нас. пункты, 13 сельсаветаў: Бакштаўскі, Васілішкаўскі, Галавічпольскі, Дэмбраўскі, Каменскі, Лядскі, Мажэйкаўскі, Навадворскі, Орлеўскі, Першамайскі, Ражанкаўскі, Ракавіцкі, Шчучынскі, 2 пас. Саветы: Астрынскі і Жалудоцкі.

Тэр. раёна пераважна ў межах *Лідскай раўніны*, паўд. ўскраіна — у межах *Верхнянёманскай нізіны*. Паверхня пласкахвалістая, з участкамі марэнных узгоркаў і шырокімі забалочанымі далінамі рэк; 76% яе на выш. 140—160 м, 14% — ніжэй за 140 м, 10% — 160—180 м. Найвыш. пункт 196 м (каля в. Вял. Мажэйкава). Агульны нахіл паверхні з З на У. Карысныя выкапні: торф, сапрапель, мел, пясчана-жвіровы матэрыял, буд. пяскі, суглінкі, праяўленні магнетытавых, сульфідна-магнетытавых і малібдэнава-медных руд. Сярэдняя т-ра студз. -5,4 °С, ліп. 17,9 °С. Ападкаў каля 550 мм за год. Вегетац. перыяд 196 сут. Найб. р. Нёман з прытокамі Лебяда, Котра (з Нявішай і Спушанкай). Азёры: Бершtаўскае, Матора. Вадасх. Будраўцы. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (47,8%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (23,6%), дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя (18,4%), поймавыя і тарфяна-балотныя (10,2%). Пад лесам 32,9% тэр., найб. лясныя масівы ў паўн.-зах. частцы раёна, напр., Катранская пушча. Пераважаюць хваёвыя, бярозавыя, яловыя, чорнаальховыя, дубовыя лясы; трапляюцца асінавыя і інш. Штучныя насаджэнні (каля 23%) пераважна хваёвыя. Пад балотамі 3,9% плошчы. На тэр. раёна ландшафтны заказнік рэсп. значэння Азёры (частка); мясц. значэння — біял. Спушанскі, ахоўны тарфянік Шчанец. Помнікі прыроды рэсп. значэння: паркі — «Вялікае Мажэйкава» і «Руткевічы»; валуны ў в. Балічы, Барташы, Вял. Пугачы («Вялікі камень»), Васілішкі, Зарэчча, Зенеўцы, Ладыга («Капцюганскі»), Кузьмы («Марцін камень»), Старыя Паддубы, Фарны Канец, Тапілішкі (група валуноў); камавы пагорак «Касцянёўскі». Помнікі прыроды мясц. значэння: паркі — «Галавічполе» і «Ражанка»; валуны ў в. Касцянёва, Красная, Ляцк Высокі, Мікулішкі, Скоржыкі, Старыя Васілішкі, Якубавічы.

Агульная пл. с.-г. угоддзяў 100,7 тыс. га, з іх асушаных каля 27,4 тыс. га. На 1.1.2003 у раёне 11 с.-г. вытв. кааператываў, 5 рэсп. с.-г. унітарных прадпрыемстваў, у т.л. 3 эксперым. базы, 1 раённае с.-г. унітарнае прадпрыемства, 3 камунальныя с.-г. унітарныя прадпрыемствы, адкрытае акц. т-ва «Іскра-Агра», вытв. комплекс «Шчучынскае пчалярства», дзяржплемгаспадарка (буйн. раг. жывёла), племянная птушкагадоўчая рэпрадукцыйная гаспадарка, 22 фермерскія гаспадаркі, Гродзенскі занальны НДІ сельскай гаспадаркі. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, свіна- і птушкагадоўлі, вырошчванні збожжавых, зернебабовых і кармавых культур, цукр. буракоў, бульбы. Прадпрыемствы металаапр., харч. (масла, цэльнамалочная прадукцыя, сыры), каап. (хлебабулачныя, макаронныя, каўбасныя вырабы) прам-сці; Шчучынскі і Лідскі лясгасы (піламатэрыялы, вываз драўніны). Па тэр. раёна праходзяць чыгунка Ваўкавыск—Ліда, аўтадарогі Гродна—Ліда, Ваўкавыск—Шчучын, Гродна—Астрына—Радунь і інш. У раёне 16 сярэдніх, 17 базавых, 1 спарт., 3 муз. школы, дапаможная школа-інтэрнат, 3 вучэбна-вытв. камбінаты, Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі, ПТВ, 27 дашкольных устаноў, 38 клубаў, 50 б-к, 7 бальніц, 3 паліклінікі, 5 амбулаторый, 36 фельч.-ак. пунктаў. Помнікі архітэктуры: царква-крэпасць (1524) у в. Мураванка, цэрквы — у в. Бершты (1816), Нарашы (канец 19 ст.); касцёлы — Іаана Хрысціцеля (1769) у в. Валянчыцы, Троіцкі (1758) і званіца (19 ст.) у в. Ішчална, Антоніеўскі (1908) у в. Каменка, Станіслаўскі (пач. 20 ст.) у в. Лядск, Юр'еўскі (1749) і капліца (1882) у в. Новы Двор, Петрапаўлаўскі (1674) і капліца (19 ст.) у в. Ражанка, св. Пятра (1903) у в. Старыя Васілішкі; сядзібы — у в. Андрушоўцы (19—20 ст.),

Вял. Мажэйкава (канец 18 — пач. 19 ст.), Галавічполе (пач. 20 ст.), Глыбокае (19 ст.), Гурнофель (пач. 20 ст.), Касцянёва (канец 19 — пач. 20 ст.), Ражанка (2-я пал. 19 ст.). Радзіма *Цёткі* (А.С.Пашкевіч). Выдаецца газ. «Дзянніца».

Літ.: Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Гродзенская вобл. Мн., 1986; Памяць: Гіст.-дак. хроніка Шчучынскага р-на. Мн., 2001. *Г.С.Смалякоў, Дз.А.Чашчэвік.*

ШЧЫ́БАТ, возера ў Лепельскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Ула, за 10 км на ПнУ ад г. Лепель, за 3 км на ПнУ ад в. Старое Лядна. Пл. 0,42 км^2, даўж. 2,43 км, найб. шыр. 320 м, даўж. берагавой лініі 5,78 км. Пл. вадазбору 3,75 км^2. Катлавіна лагчыннага тыпу, выцягнутая з З на У, размешчана сярод лесу. Схілы катлавіны стромкія, выш. да 20 м, месцамі спадзістыя. Берагі зліваюцца са схіламі, месцамі выш. да 0,5 м.

Шчыгол.

ШЧЫГО́Л, шчыгол чорнагаловы (Carduelis carduelis), птушка сям. ўюрковых атр. вераб'інападобных. Пашыраны ў Еўразіі і Паўн.-Зах. Афрыцы. Насяляе лісцевыя і мяшаныя разрэджаныя лясы, культ. ландшафты. На Беларусі звычайны від.

Даўж. цела да 16 см, маса каля 20 г. Апярэнне яркае: вакол дзюбы шырокае чырв. кальцо, крылы і хвост чорныя, на крылах папярочная жоўтая паласа, спіна карычневая, цемя і патыліца чорныя. Нясе 4—6 яец. Корміцца насеннем траў, насякомымі.

ШЧЫЛІНАВА́ННЕ ГЛЕ́БЫ, праразанне ў глебе ўпоперак схілу шчылін глыбінёй 40—60 см на адлегласці 100—150 см адна ад адной для рэгулявання паверхневага сцёку і больш поўнага паглынання талых і ліўневых вод.

Выкарыстоўваецца як аграпрыём для паляпшэння водна-фіз. уласцівасцей слабафільтруючых (гліністых і сугліністых) глеб, аховы іх ад воднай эрозіі і павышэння ўрадлівасці схілавых зямель. Робіцца *шчылінарэзнымі машынамі* на пашах, зябліве, пасевах шматгадовых траў і азімых культур; часовае Ш.г. з кратаваннем сенажацяў, пашаў і лугоў — шчылінарэзамі-кратавальнікамі і шчылінадрэнажнымі машынамі (гл. *Дрэнажныя машыны*). *В.М.Кандрацьеў.*

ШЧЫЛІНАДРЭНА́ЖНАЯ МАШЫ́НА, машына для пракладкі шчыліннага *дрэнажу* на пністых балотных глебах з мэтай адводу залішніх вод, паскарэння асадкі торфу і асваення балот.

Бываюць прычапныя і навясныя; дрэнажна-дыскавыя (ратацыйныя), дрэнажна-баравыя (ланцуговыя скрабалкавыя) і дрэнажна-вінтавыя. Праразаюць шчыліны глыб. да 1,2 м на адлегласці 6—12 м адна ад адной (у залежнасці ад выкарыстання тэр. асушэння пад пэўныя культуры). Верх шчылін закрываюць з дапамогай дыскаў або прыкочваюць гусенічнымі трактара. Гл. таксама *Дрэнажныя машыны*. *В.М.Кандрацьеў.*



Шчылінаванне глебы: а — схема рыхліцеля-шчылінавальніка канструкцыі БелНДІ меліярацыі і лугаводства (1 — рама, 2 — сферычныя дыскі, 3 — лыжа, 4 — стойкі рыхліцеля з наканечнікам, 5 — дыскавыя рыхліцелі); б — схема паглынання вады на схіле пры шчылінаванні пад сельскагаспадарчыя культуры.



Шчылінарэзныя машыны: а — з баравым рабочым органам (1 — гідрацыліндр, 2 — рэдуктар прывода рабочага органа, 3 — баравы ланцуг); б — з дыскафрэзерным рабочым органам (1 — ланцуговая перадача прывода, 2 — гідрацыліндр, 3 — дыскі з зубамі).

ШЧЫ́ЛІННАЯ АНТЭ́НА, ненакіраваная *антэна* ў выглядзе вузкай шчыліны, праразанай у плоскім ці крывалінейным метал. экране. Сканструявана так, што выпрамяненне адбываецца толькі ў адну паўпрастору адносна плоскасці экрана. Не мае частак, што выступаюць з экрана, і не парушае тым самым аэра- і гідрадынаміку аб'ектаў (напр., самалётаў, ракет), на якіх яна ўстаноўлена. Выкарыстоўваецца таксама для ўзбуджэння хваляводаў і аб'ёмных рэзанатараў і як абпрамяняльнік у складаных антэнах.

ШЧЫЛІНАРЭ́ЗНАЯ МАШЫ́НА, машына для наразання шчылін шырынёй да 300 мм у мёрзлых і трывалых грунтах з мэтай падрыхтоўкі іх да распрацоўкі землярыйнымі машынамі, а таксама для *шчылінавання глебы*. Бываюць баравыя (рабочыя органы — бясконцыя ланцугі з разцамі, або бары) і дыскафрэзерныя (з дыскавымі фрэзамі).

Манціруюцца на базе колавых і гусенічных трактароў або ланцуговых траншэйных экскаватараў. Баравыя Ш.м. звычайна маюць 1—4 рабочыя органы, яны выкопваюць адну траншэю-шчыліну або некалькі паралельных глыб. да 1,7 м. Дыскафрэзерныя больш прадукцыйныя і зносаўстойлівыя, маюць 1—3 дыскавыя фрэзы, праразаюць шчыліны глыб. да 1,1 м. Прывод рабочых органаў — ад вала адбору магутнасці трактара.

Літ.: Купченко А.И., Вавилов А.В. Механизация мелиоративных и водохозяйственных работ. Мозырь, 2000. *В.М.Кандрацьеў.*



Схемы рабочых органаў **шчылінадрэнажных машын**: а — дрэнажна-дыскавага (1 — карданная перадача, 2 — гусенічны ход, 3 — фрэза, 4 — закрывальны апарат); б — дрэнажна-баравага са скрабалкавым ланцугом (1 — навясная рама, 2 — гідрацыліндры, 3 — закрывальны апарат, 4 — баравы ланцуг, 5 — тэлескапічная рама); в — дрэнажна-вінтавога (1 і 2 — навясная і тэлескапічная рамы, 3 — шнэк, 4 — нож).

ШЧЫ́ЛЬНАСЦЬ цела, фізічная велічыня, для аднароднага цела (рэчыва) роўная адносінам масы цела да яго аб'ёму (аб'ёмная Ш.). Вызначаецца формулай $\rho = m/V$, дзе m — маса і V — аб'ём цела. Дыяпазон значэнняў Ш. прыродных рэчываў і асяроддзяў надзвычай шырокі, напр., Ш. сухога паветра пры нармальных умовах роўная 1,29 кг/м^3, вады (пры 4 °С) — 1000 кг/м^3, осмію — 22 610 кг/м^3.

Расце з павелічэннем ціску і змяншаецца з павелічэннем т-ры (за выключэннем, напр., вады, чыгуну, плаўленага кварцу ў некаторых дыяпазонах т-р). Пры плаўленні (крышталізацыі) і выпарэнні (кандэнсацыі) змяняецца скачком. Для аднародных двухмерных цел (напр., тонкай плёнкі) уводзіцца **паверхневая Ш.**, роўная адносінам масы выбранай ч. цела да плошчы яго паверхні, а для аднародных аднамерных цел (напр., тонкай ніткі) — **лінейная Ш.**, роўная адносінам масы выбранай ч. цела да яго даўжыні. Адзінка аб'ёмнай Ш. ў СІ — **кілаграм на кубічны метр**.

ШЧЫ́ЛЬНАСЦЬ НАСЕ́ЛЬНІЦТВА, ступень населенасці пэўнай тэрыторыі. Вызначаецца адносінамі колькасці пастаяннага насельніцтва на адзінку плошчы (чалавек на 1 км^2) без уліку плошчы вял. унутр. вадаёмаў. Б.ч. насельніцтва свету сканцэнтравана на ўскраінах мацерыкоў, каля мораў, на нізінах і некат. узгорыстых рэгіёнах (да 500 м над узр. м.).

Пры сярэдняй шчыльнасці заселеных мацерыкоў 46 чал. на 1 км^2 (2002) трапляюцца рэгіёны са Ш.н. каля 120 чал. на 1 км^2 (Усх. і Паўд.-Усх. Азія), у той жа час у Акіяніі Ш.н. менш за 4 чал. на 1 км^2, а на Пн Амерыкі і Еўразіі, а таксама ў высакагорных і пустынных раёнах вагаецца ад 0,01 да 1 чал. на 1 км^2. Значныя ваганні Ш.н. назіраюцца і па асобных краінах, напр., у Манголіі ў сярэднім прыпадае 2 чал. на 1 км^2, Канадзе і Аўстраліі — 3, Расіі — 8; у некат. краінах гэты паказчык значна вышэйшы, напр., у Італіі — 192, Германіі — 230, Індыі — 314, Японіі — 336, Тайвані — 625, Бангладэш — 926, Сянгане (Ганконг, з 1997 уваходзіць у КНР) — 6272, Сінгапуры — 6833 чал. на 1 км^2.

На Беларусі Ш.н. складае 48 чал. на 1 км^2 (2001). Больш шчыльна населены зах. вобласці (у Гродзенскай 47 чал. на 1 км^2, у Брэсцкай 45), менеш усх. і паўн. (у Магілёўскай — 41, Гомельскай 38, Віцебскай 34 чал. на 1 км^2). У Мінскай вобл. (з г. Мінск) 81 чал. на 1 км^2. На паказчык шчыльнасці ўплывае ха-

ШЧЫЛЬНАСЦЬ І КОЛЬКАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА, СУАДНОСІНЫ ГАРАДСКОГА І СЕЛЬСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ



рактар рассялення людзей, гушчыня і памеры паселішчаў. Гарадскія паселішчы, тэр. якіх параўнальна невял., населены больш шчыльна, чым сельская мясцовасць. Таму часта разлічваюць шчыльнасць гарадскога і сельскага насельніцтва паасобна. Напр., Ш.н. Мінска 6364 чал. на 1 км^2, Гомеля 4185, Гродна — 3332. Найб. канцэнтрацыя сельскага насельніцтва вакол буйных гарадоў, там Ш.н. можа дасягаць больш як 74 чал. на 1 км^2. *Дз.М.Кудзелка.*

С.П.**Шчыпачоў**.

ШЧЫ́ЛЬНАСЦЬ ЭЛЕКТРЫЧНАГА ТО́КУ, вектарная фіз. велічыня, якая характарызуе ўпарадкаваны рух *носьбітаў зараду*.

Ш.э.т. выражаецца формулай $\vec{j} = \rho < \vec{\upsilon} >$, дзе ρ — аб'ёмная шчыльнасць зараду; $< \vec{\upsilon} >$ — сярэдняя скорасць упарадкаванага руху дадатна зараджаных часцінак. Пры раўнамерным размеркаванні эл. току па папярочным сячэнні правадніка плошчы S сувязь модуля Ш.э.т. j з сілай току I у правадніку мае выгляд: $j = I/S$. У ізатропных асяроддзях з удзельнай эл. праводнасцю напрамкі вектараў Ш.э.т. $\vec{j}$ і напружанасці эл. поля $\vec{E}$ супадаюць: $\vec{j} = \upsilon \vec{E}$ (*Ома закон* у дыферэнцыяльнай форме). Адзінка Ш.э.т. ў СІ — ампер на квадратны метр.

П.С.Габец.

ШЧЫЛЬНЯМЕ́Р, прылада для неперарыўнага (ці перыядычнага) вымярэння *шчыльнасці* рэчыва ў розных тэхнал. працэсах. Адрозніваюць вагавыя (гл. *Пікнометр*), паплаўковыя (гл. *Арэометр*), дынамічныя (вымярэнні па хуткасці выцякання газу з тонкай адтуліны), радыеізатопныя (па інтэнсіўнасці паглынання ці рассеяння бэта- або гама-прамянёў), ультрагукавыя (па залежнасці скорасці гуку ад шчыльнасці асяроддзя) і інш. Выкарыстоўваюцца Ш. ў навук. даследаваннях і вытв. працэсах.

ШЧЫПАЧО́Ў Сяпан Пятровіч (7.1.1899, в. Шчыпачы Камышлоўскага р-на Свярдлоўскай вобл., Расія — 31.12.1979), рускі паэт. Скончыў Ін-т чырв. прафесуры (1934). У зб-ках вершаў «Па курганах стагоддзяў» (1923), «Адна шостая» (1931) «касмічная» патэтыка, дэкларатыўнасць. Вершы пра каханне, прыроду, грамадз. лірыка ў зб-ках «Вершы» (1948), «Далонь» (1964), «Таварышам па жыцці» (1972), «Каля гарызонта» (апубл. 1982) і інш. Аўтар паэм «Домік у Шушанскім» (1944), «Паўлік Марозаў» (1950), «Песня пра Маскву» (1968), «12 месяцаў вакол Сонца» (1969), «Каля кніжных паліц» (1975), аўтабіягр. аповесці «Бярозавік» (1956), успамінаў і інш. На бел. мову асобныя вершы Ш. пераклалі П.Бітэль, С.Дзяргай, Х.Жычка, В.Макарэвіч. Дзярж. прэміі СССР 1949, 1951.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—3. М., 1976—77.

Літ.: Дементьев В. Сад под ливнем: Лирика Степана Щипачева. М., 1970.

ШЧЫПО́ЎКА звычайная (Cobitis taenia), рыба сям. ўюноўых атр. карпападобных. Пашырана ў прэсных вадаёмах Еўропы (да 60° паўн. ш.) і Азіі. Насяляе ціхія мелкаводныя затокі і залівы з іліста-пясчаным грунтам, у які закопваецца. На Беларусі звычайны від. Нар. назвы каза, кусачка, сіколка, сякушка, точка.

Даўж. да 12 см. Цела падоўжанае, сціснутае з бакоў. Афарбоўка стракатая, светла-жоўтая, па баках — паласа бураватых ці чорных плям. Каля рота 6 кароткіх вусікаў. Пад вачыма высоўныя двухраздзельныя шыпы, якімі можа ўкалоць або ўшчыпнуць (адсюль назва). Характэрна *поліплаідыя* (ікра можа развівацца пры стымуляцыі спермай самцоў блізкародасных відаў). У лічынак пасля вылуплівання развіваюцца вонкавыя жабры — рэдкая з'ява для прэснаводных рыб. Корміцца дробнымі воднымі беспазваночнымі. Выкарыстоўваецца як прынада пры лоўлі драпежных рыб.

Шчыпоўка.

ШЧЫ́РЫ БЕЛАРУ́С (псеўд.; імя і гады жыцця невядомы), аўтар нелегальнай гектаграфічнай брашуры на рус. мове «Пасланне да землякоў-беларусаў», датаванай 1.1.1884. На думку некат. даследчыкаў, гэтым псеўданімам, а таксама псеўд. «Самашчыры беларусін» карыстаўся В.*Савіч-Заблоцкі*. Магчыма, належаў да групы рэв. народнікаў з асяроддзя студэнтаў-беларусаў Пецярб. ун-та. У брашуры выступаў супраць памяркоўнай пазіцыі ліберальнага народніка Д.Баравіка, што абмяжоўвалася толькі асветніцкай дзейнасцю на карысць народа. Лічыў гал. задачай вызв. руху беларусаў барацьбу супраць царызму, тагачаснага паліт. і эканам. ладу. Падкрэсліваў, што дасягнуць поспеху ў такой барацьбе можна толькі абапіраючыся на народ і аб'яднаўшыся з усімі рэв. сіламі Расіі, найперш з арг-цыяй «*Народная воля*». Паводле сваіх поглядаў быў блізкі да выдаўцоў час. «*Гомон*».

Тв.: У кн.: Публицистика белорусских народников. Мн., 1983. С. 33—59.

І.С.Александровіч.

ШЧЫТ (лац. Scutum), экватарыяльнае сузор'е. Найб. яркія зоркі 4-й візуальнай *зорнай велічыні*. У Ш. знаходзіцца адна з найб. яркіх частак *Млечнага Шляху*. З тэр. Беларусі відаць у канцы вясны, летам і восенню.



Сузор'е **Шчыт**.

ШЧЫТ, 1) элемент *засцерагальнага ўзбраення*, якое прыкрывала цела воіна ад паражэння халоднай або кідальнай зброяй. Выкарыстоўваўся з часоў каменнага веку да 15—17 ст. (у некат. народаў Цэнтр. Афрыкі, Аўстраліі, Акіяніі, Паўд. Амерыкі захаваўся да 20 ст.). Ш. рабілі з дрэва, скуры, плеценых прутоў, акоўвалі бронзай, жалезам; форма — круглая, авальная, прамавугольная, трохвугольная, часцей з выгнутай плоскасцю. Часта ўпрыгожваўся маст. выявамі; з 12 ст. на Ш. з'явіліся сімвалы — зачаткі гербаў. Ш. быў прыкметай доблесці і перамогі; на ім давалі клятву воіны, на ім неслі воіна, што загінуў у баі; яго згуба ў баі для воіна была ганьбай і жорстка каралася. 2) Бранявое пакрыцце (лісты з бранявой сталі таўшчынёй 3—10 мм з выразам для прыцэлу) у некат. артыл. гармат і кулямётаў для засцярогі разліку і механізмаў зброі ад куль і асколкаў. Мела пашырэнне з пач. 20 ст. 3) Плывучая (несамаходная) мішэнь, якую выкарыстоўваюць для практычнай стральбы на моры.

ШЧЫТ у архітэктуры, верхняя частка пераважна тарцовай сцяны, абмежаваная двума схіламі даху і не аддзеленая ўнізе *карнізам* (у адрозненне ад *франтона*). Пабудовы са стромкім 2-схільным дахам маюць востравугольны Ш. Найб. пашыраны Ш. ў архітэктуры стылю готыкі. На Беларусі вядомы з 15—16 ст. Ш. аздаблялі разнастайнымі нішамі (цэрквы-крэпасці ў вёсках Мураванка Шчучынскага, Сынковічы Зэльвенскага р-наў Гродзенскай вобл.), часам мелі крывалінейную або ступеньчатую форму (касцёл у в. Ішкалдзь Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл.). У нар. драўляным дойлідстве пашыраны Ш., вынесеныя наперад за плоскасць тарцовага фасада, маюць традыц. дэкар. аздабленне.

ШЧЫТ 1) у тэктоніцы — буйны (да тысячы кіламетраў у папярочніку) выступ *фундамента* платформы, струк-



Да арт. **Шчыт**: 1 — славянскіх воінаў 6—7 ст. (а — з бяросты; б — з лазовых дубцоў); 2 — гусарскі шчыт-тарч 16 ст.

Шчыт царквы-крэпасці ў вёсцы Сынковічы Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобл.

тура, процілеглая *пліце*. У межах Ш. складкавы крышт. фундамент выходзіць на паверхню, напр., *Алданскі шчыт, Балтыйскі шчыт, Украінскі шчыт*. Ш. — звычайна прыўзнятая вобласць на платформе, якая толькі ў перыяды макс. трансгрэсій на кароткі час залівалася морам, таму асадкі платформавага чахла тут маламагутныя і развітыя спарадычна. Контуры Ш. вельмі ўстойлівыя і захоўваюцца доўгі час. Тэрмін «Ш.» прапанаваў аўстр. геолаг Э.Зюс (1885), «Ш. крышталічны» — рус. геолаг М.С. Шацкі (1947). 2) У геаморфалогіі — ледзяны Ш., частка або ўсё наземнае ледавіковае покрыва шчытападобнай выпуклай формы магутнасцю да некалькіх кіламетраў (больш за 4 км у сучаснага антарктычнага ледавіка). 3) У горнай справе гл. *Шчыт праходчы*.

ШЧЫТ ПРАХО́ДЧЫ, перасоўнае прызабойнае метал. мацаванне, якое выкарыстоўваецца для ўтварэння *горнай выработкі*. Бывае механізаваны і немеханізаваны. Мае корпус з шчытавымі дамкратамі і гідракамунікацыямі, круглую, часам прамавугольную, эліптычную, скляпеністую (паўшчыты) і інш. форму папярочнага сячэння. Адрозніваюць Ш.п. малыя (плошча папярочнага сячэння да 10 м^2), сярэднія (10—16 м^2) і вялікія (больш за 16 м^2).

Нажавая частка Ш.п. служыць для зразання пароднага краю па контуры забоя або для ўкаранення ў забой пры праходцы выпрацаваткі метадам уціскання па сыпкіх або пластычных гліністых пародах; апорная — для размяшчэння шчытавых гідрадамкратаў перамяшчэння, рабочага органа з прыводам, пагрузачнага прыстасавання, шчытавога перагружальніка (канвеера) і інш.; хваставая — для аховы выпрацаваткі ад абрушвання. Ш.п. перамяшчаецца па меры праходкі забоя з дапамогай шчытавых дамкратаў і інш. механізмаў.

А.А.Калагрыўка.



Механізаваны **шчыт праходчы**: 1 — штангавы рабочы орган; 2 — нажавая частка шчыта; 3 — дамкраты-перасоўвальнікі; 4 — ваганеткі; 5 — блакавозка; 6 — стужачны канвеер; 7 — блокаўкладчык; 8 — пласціністы (скрабалкавы) канвеер; 9 — пагрузачнае прыстасаванне.

ШЧЫТАЗБО́РАЧНЫ СТАНО́К, дрэваапрацоўчы станок для зборкі на клеі шчытоў з рэек, бруско́ў, адрэзкаў дошак з папярэдне прыфугаванымі кантамі, асобных дэталей у вузлы і вузлоў у вырабы. Асн. элементы Ш.с. — базавая рама для падбору і ўкладвання дэталей і зацісканыя прыстасаванні (рухомыя ўпоры з пнеўматычным прыводам). Найб. пашыраныя Ш.с. — вайма і канвеерна-клеільны прэс (канвеерная вайма).

ШЧЫТАЛІ́СНІК (Hydrocotyle), род кветкавых раслін сям. парасонавых. Больш за 500 відаў. Пашыраны пераважна ў Паўн. паўшар'і. На Беларусі 1 від — Ш. звычайны (H. vulgaris), занесены ў Чырв. кнігу. Трапляецца па берагах вадаёмаў, на забалочаных месцах, тарфяніках.

Ш. звычайны — шматгадовая травяністая расліна з тонкім паўзучым, даўж. 10—100 см сцяблом, што ўкараняецца ў вузлах. Лісце акруглае, плоскае, шчытападобна прымацаванае ў цэнтры пласцінкі да доўгага прамастойнага чаранка (адсюль назва). Кветкі дробныя, непрыкметныя, белыя ці чырванаватыя, у галоўчатых парасоніках. Плод — вісласплоднік.

Дз.І.Траццякоў.

ШЧЫТАМО́РДНІКІ (Agkistrodon), род змей сям. ямкагаловых. 14 відаў. Пашыраны ў Азіі, Паўн. і Цэнтр. Амерыцы. Жывуць пераважна ў сухіх месцах, некат. звязаны з вадой.

Даўж. да 1,6 м. Афарбоўка стракатая. На пярэдняверхнім баку галавы некат. шчыткі павялічаны (адсюль назва). Яйцажывародн-



Немеханізаваны **шчыт праходчы** (выкарыстоўваецца пры будаўніцтве Мінскага метрапалітэна): 1 — шчытавыя гідраўлічныя дамкраты; 2 — апорнае кольца; 3 — корпус; 4 — нож.

Шчыталіснік звычайны.

Шчытаморднікі: 1 — звычайны; 2 — усходні.

чалавека, якая выпрацоўвае 3 гармоны: *тыраксін, трыёдтыранін* і кальцытанін (рэгулюе фосфарна-кальцыевы абмен).

Няпарны орган (радзей парны — у земнаводных і птушак), размешчаны ў сярэдняй вобласці шыі пад гартанню. Асн. марфал. і функцыян. адзінка Ш.з. — *фалікул.* Мае форму шчыта (адсюль назва) або падковы. У чалавека Ш.з. размешчана ў пярэдняй вобласці шыі, спераду і па баках ад трахеі, складаецца з 2 доляў (правай і левай), злучаных перашыйкам. Маса Ш.з. дарослага чалавека 20—60 г, нованароджанага — 1—2 г. Недахоп гармонаў Ш.з. тыраксіну і трыёдтыраніну ў раннім дзіцячым узросце прыводзіць да *крэцінізму.* *І.М.Семяненя.*

ШЧЫ́ТКАВІЦКІЯ ЛУГІ́, Шчыткаўскія Лугі, балота ў Старадарожскім і Пухавіцкім р-нах Мінскай вобл., у вадазборы рэк Піч і Случ. Нізіннага тыпу. Пл. 6,3 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 4,1 тыс. га. Глыб. торфу да 3,8 м, сярэдняя 1,5 м. Асушаныя землі пераважна пад ворывам. На неасушаных участках растуць нізкі лес, асокі і імхі, 600 га пад лесам з вольхі і бярозы. Ёсць пясчаныя астравы і грады, на некаторых з іх хваёвыя лясы.

ШЧЫ́ТКАВІЧЫ, вёска ў Старадарожскім р-не Мінскай вобл., на аўтадарозе Асіповічы—Шышчыцы. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 32 км на ПнЗ ад горада і чыг. ст. Старыя Дарогі, 106 км ад Мінска. 828 ж., 323 двары (2003). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ШЧЫ́ТНІ (Notostraca), падатрад беспазваночных жывёл атр. лістаногіх ракападобных. Вядомы з верхняга карбону. 9 відаў. Пашыраны паўсюдна ў часовых вадаёмах і азёрах. На Беларусі 2 віды: вясновы, або хвастаты (Lepidurus apus) і звычайны (Triops cancriformis).

Даўж. цела з адросткам да 10 см, з шырокім дахападобным плоскім карапаксам — шчытком (адсюль назва), на якім спераду размешчана пара складаных вачэй і няпарнае простае вочка. На галаве 5 пар, на грудзях да 70 пар грудных лістападобных ног, вонкавая ч. якіх пераўтворана ў жабры. Брушка сегментаванае, з адросткам (тэльсанам). Раздзельнаполыя. Размнажэнне пераважна пар-

Шчытні: 1 — звычайны; 2 — вясновы, або хвастаты.

тэнагенетычнае (гл. *Партэнагенез*). Яйцы вельмі жыццяздольныя (да 15 гадоў пасля высыхання і прамярзання ажываюць). Лічынкі — *наупліусы.* Развіццё з метамарфозай. Кормяцца дэтрытам, парасткамі водных раслін, дробнымі воднымі жывёламі, паядаюць малькоў рыб, чым шкодзяць рыбнай гаспадарцы.

ШЧЫТАПАДО́БНАЯ ЗАЛО́ЗА, эндакрынная залоза пазваночных жывёл і

ныя, нараджаюць 2—12 дзіцянят. Кормяцца жабамі, грызунамі, яшчаркамі, беспазваночнымі. Укус Ш. балючы, але не смяротны. У некат. краінах спажываюць у ежу. Яд выкарыстоўваецца ў медыцыне.

СУПРАЦОЎНІКІ ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ», ЯКІЯ ПРЫМАЛІ ЎДЗЕЛ У ПАДРЫХТОЎЦЫ І ВЫДАННІ 17-га ТОМА БЕЛАРУСКАЙ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ

Галоўная рэдакцыя

Галоўны рэдактар — Г.П.Пашкоў; намеснік галоўнага рэдактара Т.Я.Буракова; намеснік галоўнага рэдактара — адказны сакратар А.К.Фядосаў.

Навукова-галіновыя і кантрольныя рэдакцыі

Рэдакцыя гісторыі, філасофіі, эканомікі і права

Заг. рэдакцыі — кандыдат гістарычных навук Л.У.Языковіч; вядучыя навуковыя рэдактары В.В.Гусева, кандыдат філасофскіх навук С.Ф.Дубянецкі, Г.А.Маслыка, М.Г.Нікіцін, кандыдат гістарычных навук В.С.Пазднякоў, А.В.Скараход, В.А.Юшкевіч; навуковыя рэдактары В.В.Грынявецкі, Н.А.Дзянісава, Н.Г.Кісялёва, М.І.Рэменіца.

Рэдакцыя літаратуры і мастацтва

Заг. рэдакцыі — Л.В.Календа; вядучыя навуковыя рэдактары Г.М.Малей, Т.Р.Мартыненка, Т.В.Пешына, кандыдат філалагічных навук І.У.Саламевіч, А.В.Спрынчан; навуковыя рэдактары В.А.Войніч, Н.В.Грэская, А.І.Клімовіч, Н.В.Мароз, І.Л.Чэбан.

Рэдакцыя прыродазнаўчых і дакладных навук

Заг. рэдакцыі — кандыдат фізіка-матэматычных навук А.І.Болсун; вядучыя навуковыя рэдактары П.С.Габец, кандыдат біялагічных навук С.С.Ермакова, Т.І.Жукоўская, кандыдат біялагічных навук Л.В.Кірыленка, кандыдат гістарычных навук В.П.Кісель, Л.В.Лоўчая, кандыдат біялагічных навук А.М.Петрыкаў, У.М.Сацута, Л.М.Шахлевіч; навуковыя рэдактары В.З.Анісовіч, А.А.Дабрыцкая, А.А.Дубовік, В.Л.Мароз, кандыдат геолага-мінералагічных навук Р.Р.Паўлавец.

Рэдакцыя навуковага і літаратурнага кантролю

Заг. рэдакцыі — Ю.В.Бажэнаў; вядучыя навуковыя рэдактары М.А.Маўзон, Т.І.Нішт, М.В.Пятроўская, Е.П.Фешчанка, кандыдат гістарычных навук І.П.Хаўратовіч; навуковы рэдактар Т.У.Люковіч.

Рэдакцыя мастацка-тэхнічнай падрыхтоўкі выданняў і каардынацыі ўнутрывыдавецкай дзейнасці

Заг. рэдакцыі — Л.М.Шастакова; вядучыя мастацкія рэдактары Н.В.Барай, У.М.Жук, В.Г.Загародні; мастацкія рэдактары І.В.Каранкевіч, Т.В.Шабунька; вядучыя навуковыя рэдактары М.У.Маркевіч, Г.Р.Шыкунова; навуковыя рэдактары В.М.Вераценнікава, Г.Т.Глушчанка, В.Ф.Надзененка; тэхнічныя рэдактары М.І.Грыневіч, Н.М.Шэвель; вядучы фотакарэспандэнт Г.М.Бажанкоў; фотакарэспандэнты А.П.Дрыбас, С.Ю.Лук'янаў; вядучы інжынер-праграміст С.А.Макаёнак; інжынеры-праграмісты С.В.Вераценнікава, А.Л.Шалканаўцава; аператары Р.У.Дзявочка, Н.М.Зубкевіч, Н.У.Міраховіч, Т.М.Саленік, Н.А.Стасевіч, С.М.Хаустовіч; машыністкі Г.Л.Анісімава, Л.І.Шыбаева.

Вытворчы аддзел

Заг. аддзела — Т.М.Грыцышын; інжынеры-тэхнолагі І.В.Бурко, Ю.В.Шматкова.

Участак размнажальнай тэхнікі: Я.М.Кузьміна, Ф.А.Юркевіч.

Карэктарскі аддзел

Заг. аддзела — В.М.Чудакова; ст. карэктары Ж.С.Берасневіч, Л.А.Варабей, П.В.Грынчанка, В.А.Кульбіцкая, В.М.Лапцева.

Навуковая бібліятэка

Заг. бібліятэкі — Г.А.Краўчанка.

Агульны аддзел

Заг. аддзела — Т.А.Кароткіна; інспектар К.А.Каптурава.

Аддзел бухгалтарскага ўліку

Галоўны бухгалтар — В.І.Герыловіч; намеснік галоўнага бухгалтара Л.Я.Пілецкая; вядучыя бухгалтары В.А.Вайткевіч, І.М.Жылінская; бухгалтар І.В.Грыгор'ева.

Планава-эканамічная група

Эканаміст І.А.Азаранка.

Аддзел рэалізацыі і маркетынгу

Заг. аддзела — В.А.Рабкоў; вядучы маркетолаг А.М.Гарбаценкаў; маркетолагі В.Г.Бехціна, А.І.Кудраўцава; спецыяліст М.Ф.Пачэпка.

Гаспадарчы аддзел

Заг. аддзела — І.А.Шор.

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ТОМ 17

ХВІНЯВІЧЫ — ШЧЫТНІ

У томе змешчаны 902 ілюстрацыі, у т.л. 280 партрэтаў, 64 карты

Мастацкае афармленне *Э.Э.Жакевіча, А.М.Хількевіча*

Мастацкія рэдактары: *Н.В.Барай, В.Г.Загародні, У.М.Жук, І.В.Каранкевіч, Т.В.Шабунька*

Тэхнічныя рэдактары: *М.І.Грыневіч, Н.М.Шэвель*

Карэктары: *Ж.С.Берасневіч, Л.А.Варабей, П.В.Грынчанка, В.А.Кульбіцкая, В.М.Лапцева, В.М.Чудакова*

Падпісана да друку 14.11.03. Фармат 84×108 $^{1}/_{16}$. Гарнітура Таймс. Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 53,76. Ум. фарб.-адб. 215,88. Ул.-выд. арк. 92,97. Тыраж 10 000 экз. Заказ 13.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 10 ад 31.12.2002. Рэспубліка Беларусь. 220072, Мінск, Акадэмічная, 15а.

Надрукавана з арыгінала-макета на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Мінская фабрыка каляровага друку». Рэспубліка Беларусь. 220024, Мінск, Каржанеўскага, 20.

Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 17: Хвінявічы — Шчытні / Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. — Мн.: БелЭн, 2003. — 512 с.: іл.

Б 43

ISBN 985-11-0279-2 (т.17)
ISBN 985-11-0035-8

УДК 03(476)
ББК 92(4Беи)

ISBN 985-11-0279-2

9 789851 102798